

БЕЛАРУСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ



БЕЛАРУСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

БЕЛАРУСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ў 18 ТАМАХ

БЕЛАРУСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

БЕЛАРУСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ТОМ 15

СЛЕДАВІКІ
ТРЫО

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ:

Г.П.ПАШКОЎ (галоўны рэдактар), **В.С.АНОШКА, Я.М.БАБОСАЎ, В.К.БАНДАРЧЫК, М.А.БАРЫСЕВІЧ, В.І.БОЎШ, Т.Я.БУРАКОВА** (намеснік галоўнага рэдактара), **А.П.ВАЙТОВІЧ, І.Дз.ВАЛАТОЎСКІ, М.С.ВЫСОЦКІ, І.В.ГАЙШУН, А.М.ГАНЧАРЭНКА, Р.Г.ГАРЭЦКІ, В.М.ГУРЫН, А.М.ДАНІЛАЎ, В.В.ЗУЁНАК, М.П.КАСЦЮК, І.В.КАТЛЯРОЎ, С.Н.КНЯЗЕЎ, П.Д.КУХАРЧЫК, У.Р.ЛАТЫПАЎ, С.С.ЛАЎШУК, І.М.ЛУЧАНОК, Г.М.ЛЫЧ, Л.С.МАЛЬЦАЎ, А.В.МАЦВЕЕЎ, І.Я.НАВУМЕНКА, С.А.НІЧЫПАРОВІЧ, М.В.ПАДГАЙНЫ, А.І.ПАДЛУЖНЫ, П.Ц.ПЕТРЫКАЎ, М.Ф.ПІЛІПЕНКА, А.В.САБАЛЕЎСКІ, М.А.САВІЦКІ, А.Г.СЛУКА, М.С.СТАШКЕВІЧ, М.В.СТОРАЖАЎ, Л.М.СУШЧЭНЯ, Г.А.ФАТЫХАВА** (намеснік галоўнага рэдактара), **А.К.ФЯДОСАЎ** (намеснік галоўнага рэдактара — адказны сакратар), **І.П.ХАЎРАТОВІЧ, І.П.ШАМЯКІН, В.П.ШАРАНГОВІЧ.**

МІНСК
«БЕЛАРУСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ»
2002

УДК 03(476)
ББК 92(4Беи)
Б 43

НАВУКОВА-РЭДАКЦЫЙНЫ САВЕТ:

А.М.АБРАМОВІЧ, У.І.АДАМУШКА, А.І.АКСЁНЕНКА, Я.Я.АЛЯКСЕЙЧЫК, М.М.АЛЯХНОВІЧ, І.П.АНТОНАЎ, П.А.АПАНАСЕВІЧ, Ю.В.БАЖЭНАЎ, М.Р.БАРАЗНА, У.С.БАСАЛЫГА, В.І.БЕРНІК, А.А.БОГУШ, А.І.БОЛСУН, Ю.П.БРОЎКА, П.І.БРЫГАДЗІН, В.С.БУРАКОЎ, У.К.ВАРАБ'ЁЎ, У.П.ВЯЛІЧКА, У.С.ГЛУШАКОЎ, А.П.ГРЫЦКЕВІЧ, А.П.ДАСТАНКА, М.І.ДЗЯМЧУК, С.Ф.ДУБЯНЕЦКІ, Р.А.ЖМОЙДЗЯК, В.П.ЖУРАЎЛЁЎ, Э.М.ЗАГАРУЛЬСКІ, М.Е.ЗАЯЦ, М.А.ІЗОБАЎ, У.В.КАВАЛЁНАК, Л.В.КАЛЕНДА, Я.Ф.КАНАПЛЯ, Ф.М.КАПУЦКІ, Л.В.КІРЫЛЕНКА, В.П.КІСЕЛЬ, П.І.КЛІМУК, У.М.КОНАН, У.С.КОШАЛЕЎ, А.В.КРАСІНСКІ, Б.А.ЛАЗУКА, І.І.ЛЕАНОВІЧ, А.І.ЛЕСНІКОВІЧ, А.С.ЛІС, А.М.ЛІТВІН, І.І.ЛІШТВАН, У.Ф.ЛОГІНАЎ, Р.Ч.ЛЯНЬКЕВІЧ, З.Я.МАЖЭЙКА, А.С.МАЙХРОВІЧ, А.В.МАЛЬДЗІС, А.Я.МІХНЕВІЧ, У.М.МІХНЮК, Дз.І.МЯЦЕЛІЦА, М.В.НІКАЛАЕЎ, П.Г.НІКІЦЕНКА, В.І.ПАРФЁНАЎ, У.А.ПІЛІПОВІЧ, Л.Д.ПОБАЛЬ, І.М.ПТАШНІКАЎ, П.І.РОГАЧ, А.У.РУСЕЦКІ, А.І.РУЦКІ, С.А.СЕРГАЧОЎ, І.Д.СІПАКОЎ, Э.М.СКОБЕЛЕЎ, Р.Б.СМОЛЬСКІ, А.А.ТОЗІК, А.А.ФІЛІМОНАЎ, В.А.ФЯДОСІК, Л.У.ХАТЫЛЁВА, В.С.ЦІТОЎ, Ю.М.ЧУРКО, В.У.ЧЭЧАТ, В.Ф.ШМАТАЎ, Г.В.ШТЫХАЎ, Дз.І.ШЫРАКАНАЎ, Г.М.ШЭЙКІН, Л.У.ЯЗЫКОВІЧ.

НАВУКОВЫЯ КАНСУЛЬТАНТЫ:

М.Э.АБАЛА (Латвія), А.А.АБРАМЧУК, Т.І.АДУЛА, Р.М.АЛАДАВА, В.А.АНТАНЕВІЧ, А.Ц.БАЖКО, Я.І.БАРАНОЎСКІ, А.А.БАРШЧЭЎСКІ (Польшча), Л.П.БАРШЧЭЎСКІ, С.І.БЕЛЬСКАЯ, А.М.БУЛЫКА, М.С.ВАЙТОВІЧ, Г.В.ВАЛАБУЕВА, З.А.ВАЛЕВАЧ, А.І.ВАЛОЖЫН, Э.А.ВАЛЬЧУК, А.А.ГАЛАЎКО, А.І.ГАЛАЎНЁЎ, С.В.ГОВІН, Л.І.ГУРСКІ, А.А.ГУСАК, Б.Дз.ДАЛГАТОВІЧ, І.У.ДУДА, А.М.ЕЛСУКОЎ, А.І.ЕРАШОЎ, А.І.ЖУРАЎСКІ, У.Р.ЗАЛАТАГОРАЎ, Р.Г.ЗАЯЦ, Э.Р.ІОФЕ, У.Ф.ІСАЕНКА, Л.Р.КАЗЛОЎ, Л.В.КАЗЛОЎСКАЯ, В.М.КАНДРАЦЬЕЎ, Р.КАРЭЦКАС (Літва), М.М.КАСЦЮКОВІЧ, У.У.КОЖУХ, У.К.КОРШУК, Г.Р.КУЛЯШОВА, У.Ф.ЛАДЫСЕЎ, А.А.ЛАЗАРЭВІЧ, А.П.ЛАПІНСКЕНЕ (Літва), У.С.ЛАРЫЁНАЎ, А.П.ЛАСКАЎНЁЎ, М.В.ЛАЎРЫНОВІЧ, А.С.ЛЕАНЦЮК, У.І.ЛЕМЯШОНАК, Э.А.ЛІПЕЦКІ, Е.А.ЛЯВОНАВА, К.Л.МАЙСЯЙЧУК, С.Дз.МАЛЮКОВІЧ, В.Дз.МАРОЗАЎ, Я.Г.МІЛЯШКЕВІЧ, Т.М.МІХЕЕВА, Л.І.НАВУМЕНКА, В.М.НАВУМЧЫК, А.І.НАРКЕВІЧ, В.Л.НАСЕВІЧ, М.М.ПАГРАНОЎСКІ, М.А.ПАКЛОНСКІ, М.Р.ПРАКАПЧУК, В.М.ПРОХАРАЎ, П.А.ПУПКЕВІЧ, В.П.РАГОЙША, Л.М.РАЖАНАВА, Г.В.РАТНІКАЎ, А.РАЧЫС (Літва), М.П.САВІК, У.Л.САКАЛОЎСКІ, Л.Ф.САЛАВЕЙ, Э.Р.САМУСЕНКА, С.Н.САРЫНЯН (Арменія), Я.М.САХУТА, І.С.САЦУНКЕВІЧ, В.Дз.СЕЛЯМЕНЕЎ, І.М.СЕМЯНЕНЯ, У.М.СЕЎРУК, Г.В.СІНІЛА, І.І.СІНЧУК, В.П.СЛАВУК, У.Е.СНАПКОЎСКІ, М.Ф.СПІРЫДОНАЎ, Г.Г.СЯРГЕЕВА, А.П.ТКАЧЭНКА, В.Ф.ЦАРОВА (Латвія), А.А.ЦІТАВЕЦ, Г.А.ЦЫХУН, В.А.ЧАБАНЕНКА (Украіна), А.А.ЧАЛЯДЗІНСКІ, В.М.ЧАРНАТАЎ, І.А.ЧАРОТА, Г.Г.ШАНЬКО, А.В.ШАРАПА, Л.П.ШАХОЦЬКА, Я.Ф.ШУНЕЙКА, А.П.ШЧУРАЎ, А.А.ШЫМБАЛЁЎ, М.Р.ЮРКЕВІЧ, М.З.ЯГОЎДЗІК, В.І.ЯКАЎЧУК.

Мастацкае афармленне Э.Э.ЖАКЕВІЧА, А.М.ХІЛЬКЕВІЧА

ISBN 985-11-0251-2 (т. 15)
ISBN 985-11-0035-8

© Выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя»
імя Петруся Броўкі, 2002

С

СЛЕДАВІКІ́, камяні-валуны з поўнасцю ці часткова выбітай выявай слядоў чалавека (імітацыя босай ці абутай ступні або рукі) або розных жывёл ці міфічных істот. Пашыраны ў Еўропе і Азіі, трапляюцца ў Афрыцы. С. — праяўленне язычніцкіх культаў. Мяркуюць, што культ камянёў-С. узнік у бронзавым веку ў 2-м тыс. да н.э. Бытуюць легенды, нібыта раней камяні былі больш мяккія і розныя істоты пакідалі на іх сляды. Вада са слядоў лічылася гаючай. З пашырэннем хрысціянства многія С. набылі функцыі *прошчаў*. На Беларусі вядома больш за 70 С., сканцэнтраваных пераважна на Пн і ў цэнтры краіны. Найб. вядомыя камяні-С. каля вёсак Дзераўно Лагойскага р-на і Кудзінавічы Капыльскага р-на Мінскай вобл., Малькавічы Ганцавіцкага р-на Брэсцкай вобл., Наўгароды Міёрскага р-на Віцебскай вобл., Сянежычы Навагрудскага р-на Гродзенскай вобл. і інш.



Да арт. **Следавікі**. Камень са «слядамі» Багародзіцы каля в. Сянежычы Навагрудскага раёна Гродзенскай вобл.

СЛЕДЗЮКІ́, вёска ў Быхаўскім р-не Магілёўскай вобл., каля аўтадарогі Гомель—Магілёў. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 13 км на ПнУ ад горада і чыг. ст. Быхаў, 35 км ад Магілёва. 964 ж., 406 двароў (2001). Лесапільня, млын. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

СЛІ́ДСТВА, у крымінальным працэсе — збіранне і праверка доказаў, неабходных і дастатковых для высвятлення акалічнасцей, што ўваходзяць у прадмет даказвання. Складаецца з папярэдняга С. (у Рэспубліцы Беларусь ідзе за ўзбуджэннем крымін. справы і ажыццяўляецца *следчымі* пракуратуры, органаў мін-ва ўнутр. спраў, дзярж. бяспекі і фін. расследаванняў, а таксама органамі дазнання) і судовага С., якое ажыццяўляе суд. пасяджэнне і з'яўляецца састаўной часткай *судаводства* з удзелам абвінавачанага, яго абаронцы, пацярпелага, істца і адказчыка (іх прадстаўнікоў). Пры гэтым робіцца праверка доказаў, сабраных папярэднім С., збіранне і праверка новых доказаў з мэтай усебаковага, аб'ектыўнага высвятлення ўсіх істотных акалічнасцей справы. Судовае С. вядзецца вусна ва ўмовах галоснасці, неперарыўнасці суд. разбору, нязменнасці складу *суда* (суддзі), роўнасці правоў удзельнікаў суд. працэсу. Па ўсіх справах публічнага, прыватна-публічнага і прыватнага абвінавачання, узбуджаных пракурорам, абавязковы ўдзел у суд. разборы дзярж. абвінаваўцы, які агалошвае абвінавачанне, прад'яўляе доказы, удзельнічае ў даследаванні, выказвае сваю думку па сутнасці абвінавачання, робіць суду прапанову аб прымяненні крымін. закону і назначэнні абвінавачанаму пакарання, прад'яўляе або падтрымлівае заяўлены іск, калі гэта патрабуе абарона правоў грамадзян, дзярж. або грамадскіх інтарэсаў. Калі ў ходзе суд. разбору будзе высветлена, што прад'яўленых доказаў недастаткова для пастановы прыгавору, суд па хадайніцтве бакоў прыпыняе справу і прапануе дзярж. абвінаваўцу арганізаваць правядзенне дадатковага С. ці інш. працэсуальных дзеянняў. Суд мае права спыніць справу, калі для гэтага будуць законныя падставы. Суд. разбор крымін. справы праводзіцца толькі ў адносінах абвінавачанага і толькі па тым абвінавачанні, якое таму было прад'яўлена на папярэднім С. Суд правамоцны змяніць кваліфікацыі злачынства незалежна ад пазіцыі дзярж. абвінаваўцы, калі гэта не пагаршае становішча абвінавачанага і не патрабуе змены сутнасці абвінавачання. *Г.А.Маслыка.*

СЛІ́ДЧЫ, службовая асоба пракуратуры, органаў папярэдняга следства мін-ва ўнутр. спраў, дзярж. бяспекі і фін. расследаванняў, якая ажыццяўляе папярэдняе *следства*. С. абавязаны прымаць усе меры да ўсебаковага, поўнага і аб'ектыўнага даследавання акалічнасцей крымін. справы, ажыццяўляць крымін. праследаванне асобы, у адносінах якой сабраны дастатковыя доказы аб ўчыненні ёю злачынства, шляхам прыцягнення яе ў якасці абвінавачанага, прад'яўлення абвінавачання, ужыванні ў адносінах да яе *меры стрымання*, перадачы яе справы *пракурору* для накіравання ў *суд*. С. таксама абавязаны прымяць меры па забеспячэнні бяспекі ўдзельнікаў крымін. працэсу і інш. асоб у адпаведнасці з патрабаваннямі заканадаўства. Ён правамоцны ўзбуджаць крымін. справу ці адмаўляць у яе ўзбуджэнні, спыняць ці прыпыняць папярэдняе следства па крымін. справе, ажыццяўляць усе следчыя і інш. працэсуальныя дзеянні, прадугледжаныя законам. Пастановы С., вынесеныя ў адпаведнасці з патрабаваннямі закону, па крымін. справах, што знаходзяцца ў яго вядзенні, абавязковыя для выканання ўсімі юрыд. і службовымі асобамі і грамадзянамі. *Г.А.Маслыка.*

СЛІ́ДЧЫ ЭКСПЕРЫМЕ́НТ, следчае дзеянне, неабходнае для праверкі фактычных даных, што маюцца ў справе, праз правядзенне доследаў і выпрабаванняў ва ўмовах, максімальна набліжаных да расследуемай падзеі. У адпаведнасці з крымінальна-працэсуальным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь пры С.э. правяраецца магчымасць учынення пэўных дзеянняў, выяўляецца паслядоўнасць таго, што адбылося, і механізм утварэння слядоў. Пры неабходнасці да С.э. могуць прыцягвацца падазроныя,

абвінавачаныя, сведкі, спецыялісты, эксперты і асобы, якія праводзяць даследныя дзеянні. Парадак правядзення С.э. рэгламентуецца законам, вынікі яго замацоўваюцца пратаколам. *Г.А.Маслыка.*

СЛЕЖА́ВІЧУС (Sleževičius) Мікалас (21.2.1882, в. Дрэмбляй Каўнаскага пав., Літва — 11.11.1939), літоўскі паліт. і дзярж. дзеяч. Адвакат. Скончыў Новарасійскі ун-т у г. Адэса (Украіна, 1907). З 1907 чл. Літ. дэмакр. партыі, рэдактар шэрагу ліберальных перыяд. выданняў. У 1-ю сусв. вайну эвакуіраваўся ў Расію, дзе ў 1917 уступіў у партыю сацыялістаў ляўдынінкаў-дэмакратаў. Пасля вяртання на радзіму ў снеж. 1918 — сак. 1919 і крас. — кастр. 1919 прэм'ер-міністр незалежнай Літвы. У 1920—27 дэп. сейма. У 1926 зноў прэм'ер-міністр, міністр замежных спраў і юстыцыі Літвы; падпісаў дагавор аб узаемным ненападзе і нейтралітэце паміж Літ. Рэспублікай і СССР (гл. *Савецка-літоўскія дагаворы*). У 1922—36 старшыня партыі ляўдынінкаў (Саюз сялян ляўдынінкаў Літвы, засн. ў 1922 у выніку аб'яднання ляўдынінкаў з Саюзам сялян Літвы, які ўзнік у 1905); прытрымліваўся палітыкі супрацоўніцтва з аўтарытарным урадам А.*Сметаны*.

Літ.: Lietuvos Respublikos ministrai pirmininkai, 1918—1940. Vilnius, 1997.

СЛЕ́ЙТАН (Slayton) Доналд (1.3.1924, г. Спарта, штат Вісконсін, ЗША — 13.6.1993), касманаўт ЗША. Маёр ВПС (у адстаўцы). Скончыў Мінесоцкі ун-т (1949), школу лётчыкаў-выпрабавальнікаў (1956). З 1959 у групе касманаўтаў НАСА. Кіраваў аддзелам НАСА, службай падрыхтоўкі экіпажаў касм. караблёў. 15—25.7.1975 з В.*Брандам* і Т.*Стафардам* здзейсніў (як пілот стыковачнага адсека) палёт на касм. караблі «Апалон» па праграме *«ЭПАС»*. Правёў у космасе 9,1 сут. Залатыя медалі НАСА «За выдатныя заслугі» (3), «За выключныя заслугі». Залаты медаль імя Ю.А.Гагарына. *У.С.Ларыёнаў.*

СЛЕПАЗМЕ́ЙКІ, слепуны (Typhlopidae), сямейства змей. 5—6 родаў, больш за 170 відаў. Пашыраны ў трапічных і субтрапічных абласцях. Жывуць у глебе, спосаб жыцця рыючы. Найб. вядомая С. звычайная (Typhlops vermicularis).

Даўж. 10—80 см. Цела тонкае, чэрвепадобнае, укрытае дробнымі акруглымі лускавінкамі. Хвост кароткі, тоўсты, на канцы невял. шыпік. Вочы рэдукаваныя (адсюль назва), знаходзяцца пад скурай. Яйцакладныя, некат. яйцажывародныя. Кормяцца дробнымі беспазваночнымі.

СЛЕПАКО́ВЫЯ, слепакі, сляпцы (Spalacidae), сям. млекакормячых атр. грызуноў. 1 (2) роды, 4 (8) відаў. Пашыраны на Пд Сярэдняй і Усх. Еўропы, у Пярэдняй і М. Азіі, Паўн.-Усх. Афрыцы. Жывуць у норах у лесастэпах, раўнінных і горных стэпах.

Даўж. да 35 см, маса да 570 г. Цела валькаватае, галава шырокая, шыя і хвост кароткія. Вушныя ракавіны не развіты, вочы пад скурай (адсюль назва), хрусталік рэдукаваны. Разцы тырчаць з рота (С. не рыюць, а выгрызаюць зямлю). Футра шаўкавістае, вохрыста-бурае. Кормяцца пераважна падземнымі ч. раслін. Нараджаюць да 4 дзіцянят за год.

Э.Р. Самусенка.



Да арт. **Слепаковыя**. Сляпак звычайны.

СЛЕПАТА́, страта *зроку*. Адрозніваюць С. аднаго або абодвух вокаў, няпоўную (захаваны астаткавы зрок) і поўную (няздольнасць адрозніваць святло ад цемры, вастрыня зроку 0), прыроджаную (парушэнне ўнутрывантробнага развіцця зрокавага аналізатара), набытую (захворванні і траўмы вока і мозга), прафес. (траціцца здольнасць прафес. працы), колерную (выпадзенне аднаго або двух кампанентаў колеру), вылечную (напр., замена хрусталіка пры катаракце) і невылечную. Асн. прычыны — атрафія зрокавага нерва, *глаўкома*, *катаракта*, траўмы, пашкоджанне рагавіцы, блізарукасць і інш. Гл. таксама *Афтальмалогія*. *І.М.Семяненя.*

«СЛЕПАЎРО́Н», прыватнаўласніцкі герб, якім у Беларусі, Літве, Украіне і Польшчы карысталіся больш за 350 родаў, у т.л. Гасеўскія, Касакоўскія, Красінскія, Пуласкія. Мае ў блакітным полі выяву сярэбранай падковы канцамі ўніз, на ёй сярэбраны кавалерскі крыж, на якім сядзіць чорны крумкач з залатым пярсцёнкам у дзюбе. Клейнод — над прылбіцай з каронай такі самы крумкач з пярсцёнкам. Вядомы з сярэдзіны 14 ст. У 16 ст. ад герба «С.» утварыўся герб *«Корвін»*.

СЛЕПНЯКІ́ (Miridae), сямейства клапоў. Больш за 6 тыс. відаў. Пашыраны ўсюды. На Беларусі каля 150 відаў. Найб. пашыраныя С.: бурачны (Polymerus cognatus), вандроўны клопік (Notostira erratica), гладкі (Stenodema laevigatum), збожжавы (Leptopterna dolabrata), люцэрнавы клоп (Adelphocoris lineolatus).

Даўж. 2—11 мм. Цела падоўжанае, найчасцей зялёнае або чорнае. Простых вочак няма (адсюль назва). Ротавыя органы колюча-сысучыя. Ператварэнне няпоўнае. 1—3 пакаленні за год. Пераважна расліннаедныя, ёсць драпежнікі і з мяшаным кармленнем. Многія шкодзяць с.-г. культурам.

СЛЕ́САРАЎ Іван Канстанцінавіч (30.11.1926, с. Ілек Арэнбургскай вобл., Расія — 1.4.1998), бел. вучоны ў галіне жывёлагадоўлі. Д-р біял. н. (1972), праф. (1977). Скончыў Арэнбургскі с.-г. ін-т (1952). З 1961 у Бел. НДІ жывёлагадоўлі. Навук. працы па пытаннях бялковага кармлення с.-г. жывёлы з выкарыстаннем сінт. азоцістых рэчываў, арган. к-т, смакавых і ўзбагачальных дабавак хім. і мікрабіял. сінтэзу.

Тв.: Пути решения проблемы белка в животноводстве. Мн., 1981 (у сааўт.); Минеральное питание крупного рогатого скота. Мн., 1987 (разам з А.С.Зяньковым); Минеральные источники Беларуси для животноводства. Мн., 1995 (разам з М.У.Пілюком).

СЛЕСАРЭ́НКА Аляксей Аляксеевіч (н. 7.3.1919, Кіеў), бел. пісьменнік, акцёр эстрады. Засл. дз. культуры Беларусі (1960). Скончыў акцёрскую студыю ў Маскве (1938) і курсы маст. чытання (1949). Працаваў на кінастудыі «Масфільм» (1934—39), у т-ве «Веды». З 1955 майстар маст. чытання Белдзяржфілармоніі, адначасова ў 1969—74 працаваў у Літ. музеі Я.Коласа. У рэпертуары творы бел. і рус. пісьменнікаў, а таксама ўласныя літ. кампазіцыі: «Народны паэт БССР Якуб Колас», «Успаміны пра Янку Купалу», «Проза Васіля Быкава», «Паэзія Максіма Багдановіча», «Сатыры Кандрата Крапівы», «Паэзія Адама Міцкевіча», «Проза Кузьмы Чорнага» і інш. Аўтар мемуарна-дакумент. кніг пра дзеячаў л-ры і мастацтва: «Дарогі і песні» (1965), «Дарагія абліччы» (1967), «Аляксандр Даўжэнка. Шлях да слова» (1974, на ўкр. мове), «Жыццё ў мастацтве» (1977), «Працяг радасці» (1981). Пераклаў на бел. мову кнігу А.Маякоўскай «Дзіцячыя і юнацкія гады У.Маякоўскага» (1957). Зняўся ў маст. фільмах «Палескія рабінзоны», «Бежын луг», «Вясёлыя хлопцы», «Аэраград». *Л.С.Савік.*

СЛЁЗАТАЧЫ́ВЫЯ АТРУ́ТНЫЯ РЭ́ЧЫВЫ, тое, што *лакрыматары*.

СЛЁЗНАЯ ЗАЛО́ЗА, буйная залоза вока наземных жывёл і чалавека. Размешчана пад верхнім павекам вонкавага вугла вачніцы. У слізістай абалонцы вока ёсць і дабавачныя С.з. (напр., у чалавека 1—22). Выпрацоўваюць слёзы — празрыстую вадкасць, у якой да 99% вады, 0,9% неарган. рэчываў, пераважна хлорыстага натрыю, эпітэліяльныя клеткі, слізь, тлушч, лізацым — фермент, што мае бактэрыцыдныя ўласцівасці. Па слёзным канале слёзы сцякаюць да ўнутр. вугла вока ў слёзны мяшок і далей — у насаслёзны канал. Увільгатняюць пярэднюю паверхню вока, вымываюць іншародныя целы, удзельнічаюць у жыўленні рагавіцы. Слёзавыдзяленне — бесперапынны рэфлектор-

ны працэс, спыняецца ў час сну. У чалавека за суткі выдзяляецца 0,5—1 мл слёзнай вадкасці, пры плачы да 30 мл. Сакрэцыя павялічваецца пры некат. псіхічных станах (боль, гнеў, радасць, смутак), памяншаецца пры захворваннях (напр., трахаматозны ксероз). У водных млекакормячых С.з. выпрацоўвае тлушчавы сакрэт, які ахоўвае рагавіцу ад уздзеяння вады. *А.С.Леанцюк.*

СЛІ́ВА (Prunus), род кветкавых раслін сям. ружавых. Больш за 30 відаў (паводле інш. звестак каля 400). Пашыраны ва ўмераным поясе Еўразіі і Паўн. Амерыкі. На Беларусі 1 від — С. калючая, або *цёрн*, занесеная ў Чырв. кнігу. Трапляецца на ўзлесках, у драбналессі і хмызняках прырэчных тэрас на Пд рэспублікі. Культывуецца некалькі відаў пладовых культур С.: *алыча*; амерыканская (P. americana); дамашняя (P. domestica) — натуральны гібрыд скрыжавання цёрну з алычой, вядома больш за 3 тыс. гадоў; кітайская (P. salicina); цярновая (P. insititia).

Лістападныя кусты або дрэвы выш. 3—12 м. Лісце суцэльнае, зубчастае, эліпсоіднае, з кароткім чаранком. Кветкі двухполыя, адзіночныя або ў пучках, белыя, радзей зеленаватыя, руковыя. Плод — сакаўная касцянка з бакавой баразёнкай, бледна-зялёная, жоўтая, чырв., фіялетавая, чорна-сіняя, з васковым налётам. Плады спажываюцца ў ежу, з іх гатуюць сокі, кампоты, марынады, варэнне, глазураваныя фрукты, з высокацукровых сартоў — чарнасліў. Харч., меданосныя, дэкар., лек., тэхн. (драўніна і камедзь) расліны. *А.М.Скуратовіч.*

СЛІ́ВА КАЛЮ́ЧАЯ, кветкавая расліна, тое, што *цёрн*.

СЛІ́ВАВАЯ ПЛАДАЖЭ́РКА (Grapholitha funebrana), матыль сям. ліставёртак. Шкоднік слівы, алычы, цёрну, абрыкоса, персіка, вішні. Пашырана ў Еўропе, Паўн. Афрыцы, Азіі, Зах. Сібіры.

Крылы ў размаху 12—15 мм, пярэднія — шаравата-карычневыя з авальнай свінцова-шэрай плямай на вонкавым краі, заднія — светла-шэрыя з махрамі. Вусені зімуюць у шчыльных павуціністых коканах у трэшчынах кары дрэў, радзей у глебе. Матылі вылятаюць пасля цвіцення слівы, яйцы адкладваюць на плады. Вусені выядаюць мякаць пладоў, якія заўчасна ападаюць. У адным плодзе можа развівацца да 5 вусеняў. Дае 2 пакаленні за год.



Слівавая пладажэрка: 1 — дарослы матыль; 2 — пашкоджаныя плады; 3 — кукалка; 4 — вусень.

СЛІ́ВЕН, горад у Балгарыі, каля паўд. схілаў гор Стара-Планіна. Каля 120 тыс. ж. (2000). Чыг. ст., вузел аўтадарог. Адзін са старэйшых (з 1830-х г.) тэкст. цэнтраў краіны. Прам-сць: маш.-буд., у т.л. вытв-сць станкоў, аўтамаб. дэталей, электралямпаў і інш.; харчасмакавая, шкляная, мэблевая. Дыванаткацтва. Музеі. Паблізу — бальнеалагічны курорт Слівенскі-Мінеральні-Бані.

СЛІ́ДЗЕЦ, возера ў Чашніцкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Лукомка, за 11 км на Пд ад г. Чашнікі. Пл. 0,55 км², даўж. 1,9 км, найб. шыр. 480 м, найб. глыб. 19,1 м, даўж. берагавой лініі 6,3 км. Пл. вадазбору 8 км². Катлавіна лагчыннага тыпу. Схілы выш. 10—25 м, у ніжняй ч. стромкія, пад хмызняком. Берагі пераважна зліваюцца са схіламі, пясчаныя; на Пн, Пд і З — сплавінныя, акаймаваныя забалочанай поймай шыр. 10—80 м. У паўд. ч. возера вял. заліў. Дно да глыб. 4 м выслана пясчанымі і апясчаненымі адкладамі, глыбей ілам. Зарастае слаба.

СЛІ́ЖЫК Пётр, бел. злотнік 2-й пал. 18 ст. Працаваў у тэхніцы чаканкі. Выканаў абклады абразоў «Маці Божая Адзігітрыя» (1774, 1775), якія захоўваліся ў Іосіфаўскім саборы ў Магілёве і ў царкве ў г. Дзісна (Міёрскі р-н Віцебскай вобл.).

СЛІЗЕВІКІ (Myxomycota), група грыбападобных арганізмаў няпэўнага сістэматычнага становішча. Традыцыйна вылучаліся ў аддзел ніжэйшых раслін, у сучаснай заал. сістэматыцы іх адносяць да прасцейшых. Падобныя на грыбы (адсутнасць хларафілу, наяўнасць спараўтварэння, пладовыя целы, пераважна сапратрофны тып жыўлення) і на жывёл (здольнасць да актыўных амёбападобных рухаў). 2 кл.: акразіяміцэты (клетачныя С.) і міксаміцэты (сапраўдныя С.), якія падзяляюцца на 3 падкл.,



Сарты **слівы** дамашняй: 1 — Нарач; 2 — Беларуская; 3 — Венгерка звычайная; 4 — Мясцовая чырвоная.

больш за 400 відаў. Пашыраны паўсюдна. На Беларусі найб. вядомыя роды лікагала, стэманітыс, трыхія, фізарум, фуліга і інш. Трапляюцца ў глебе, гнілых пнях, пад карой, апалым лісцем.

Міксаміцэты маюць вегетатыўнае цела ў выглядзе слізістай, без абалонкі, шмат'ядзернай (ядры дыплоідныя) пратаплазмы — *плазмодыя* дыяметрам ад некалькіх міліметраў да 1 м, ярка афарбаванае (лімонна-жоўтае, ружовае, чырв., фіялетавае да амаль чорнага). У перыяд вегетатыўнага развіцця С., што жывуць свабодна, насяляюць вільготныя, цёмныя месцы. На святло выпаўзаюць для ўтварэння на субстраце пладовых цел (*спарангіяў* і эталіяў), у якіх фарміруюцца гаплоідныя споры (у вадзе прарастаюць у *зааспоры*, у вільготным асяроддзі — у міксамёбы). Пры іх капуліраванні парамі ўтвараюцца дыплоідныя міксамёбы, якія шматразова дзеляцца, растуць і фарміруюць плазмодый. Пры неспрыяльных умовах (сухасць субстрату, нізкая т-ра, адсутнасць корму) плазмодый ператвараецца ў *склероцый*.

Літ.: Жизнь растений. Т. 2. М., 1976; Стрельская О.Я. Низшие растения. Систематика. Мн., 1985; Мюллер Э., Леффлер В. Микология: Пер. с нем. М., 1995.

С.І.Бельская.

СЛІ́ЗЕНЬ Рафал (27.6.1804, б. маёнтак Бортнікі, Баранавіцкі р-н Брэсцкай вобл. — 20.5.1881), бел. скульптар, жывапісец, медальер, архітэктар. Пачатковую адукацыю атрымаў у школе базыльян у мяст. Вольна (Навагрудскі пав.), пасля вучэння ў езуіцкай школе ў Полацку. У 1820 паступіў на юрыдычны ф-т Віленскага ун-та, адначасова наведваў Віленскую маст. школу, вучыўся ў



Р.Слізень. Медальён з выявай Т.Зана. 1-я пал. 19 ст.

Я.*Рустэма* і К.*Ельскага*. Пасля сканчэння ун-та ў 1826—29 працаваў у Мін-ве ўнутр. спраў у Пецярбургу. У 1830 вярнуўся ў свой маёнтак, дзе стварыў некалькі дзесяткаў жывапісных і скульптурных партрэтаў сваіх родных, знаёмых, суседзяў, якія вызначаюцца тонкасцю і глыбінёй індывідуальных характарыстык (партрэты Марылі, Францішкі і Міхаіла Верашчакаў). Выканаў 57 медальёнаў, у т.л. сваіх бацькоў Яна і Анелі Слізняў, прысвечаныя іх залатому вяселлю, а таксама Уладзіслава, Люцыяна, Браніслава Слізняў, барэльефы і медальёны Т.Зана, Я.Чачота, А.Э.Адынца, А.Міцкевіча, К. і Я. Тышкевічаў, А.Храптовіча, Г.Ржавускага і інш., у пластычнай трактоўцы якіх адчуваецца смелае выкарыстанне традыцый класіцызму і рамантызму. Паводле яго праектаў пабудавана некалькі палацаў і гасп. пабудоў.

А.К.Лявонава.

СЛІ́ЗІ, рэчывы расліннага, жывёльнага і мікробнага паходжання, якія ўтвараюць вязкія водныя растворы. У расліні С. — гідрафільныя поліцукрыды, назапашваюцца пераважна ў слізевых хадах насення, каранёў, кары. Здольнасць С. да набракання ў вадзе спрыяе прарастанню семя, назапашванне С. ў тканках раслін (напр., кактусы, малачаі) павышае іх засухаўстойлівасць. У жывёл С. — сакрэты слізістых залоз, якія выдзяляюцца на паверхню скурнага покрыва і ва ўнутр. поласці некат. органаў. Па хім. прыродзе — складаныя сумесі глікапратэідаў. Прадухіляюць органы і покрыўныя тканкі ад мех. пашкоджанняў, спрыяюць руху ежы па стрававальным тракце, маюць імуналагічную і бактэрыцыдную актыўнасць. У некат. бактэрый клетачная сценка пакрыта слізістай капсулай, якая ахоўвае патагенныя мікробы ад фагацытаў.

СЛІ́ЗІСТАЯ АБАЛО́НКА, абалонка, якая высцілае ўнутр. паверхню стрававальнага тракту, дыхальных і мочапалавых шляхоў, прыдаткавых поласцей носа, сярэдняга вуха, вывадных пратокаў залоз. Паверхня С.а. пастаянна ўвільгатняецца *слізэю*, якая выпрацоўваецца размешчанымі ў ёй слізістымі залозамі і засцерагае ўнутр. паверхню органаў ад высыхання.

Складаецца з 3 слаёў: *эпітэлію* (адна- або шматслойнага), *злучальнай тканкі* (аснова С.а., дзе размешчаны крывяносныя і лімфатычныя сасуды, нервы, лімфоідныя намнажэнні) і мышачнай пласцінкі. С.а. бывае гладкая або складкавая. Тканкавыя элементы С.а. здольныя да *рэгенерацыі*.

А.С.Леанцюк.

СЛІ́ЗНІ, шляхецкі род уласнага герба ў ВКЛ. Вядуць радавод ад паўлегендарнага Ратшы, нашчадкі якога служылі ў кн. Аляксандра Неўскага, вял. князёў цвярскіх і маскоўскіх. Некат. прадстаўнікі роду перасяліліся ў ВКЛ. Іван Андрэевіч Толпык-Слізень, паводле некат. звестак, быў прызначаны вял. кн. ВКЛ Вітаўтам ваяводам бранскім. Найб. вядомыя:

Аляксандр (1579—11.1.1651), сын Рыгора, стольнік ашмянскі, староста мядзельскі, выбіраўся паслом на соймы, дэпутатам Трыбунала ВКЛ. Як каралеўскі сакратар двойчы ездзіў паслом у Маскву. Стафан Ян (? — да 5.7.1707), сын Аляксандра, рэферэндар ВКЛ з 1705, староста крэўскі, пасол на сойм 1696, маршалак Трыбунала ВКЛ у 1705. Міхал Брунон (? — да 12.5.1729), сын Аляксандра, генеральны стражнік войска ВКЛ з 1698, падстолі ашмянскі ў 1708—15, пісар скарбовы ВКЛ з 1715. Міхал (?—11.11.1760), сын Стафана Яна, падканюшы ВКЛ з 1736, староста крэўскі, быў 12 разоў паслом на соймы, тройчы дэпутатам



Слізевікі: 1 — цэратыямікса; 2 — лікагала; 3 — фізарум; 4 — леакарпус.

Трыбунала ВКЛ. Стафан (?—1780?), сын Міхала, староста крэўскі, падкаморы слонімскі з 1756, ген.-маёр войска ВКЛ. Рафал (?—2.6.1817), сын Юзафа, стольнік старадубскі ў 1776—83, пісар скарбовы ВКЛ у 1781—82, інстыгатар ВКЛ з 1782, староста крэўскі з 1781, ген.-ад'ютант войска ВКЛ. Юзаф (? — каля 1856), сын Міхала, бабруйскі маршалак у 1804—07. У сваім маёнтку Мсціж Барысаўскага пав. сабраў вял. калекцыю манет і скарбаў, мінералаў, прадметаў мастацтва. Заклаў бат. сад і аранжарэю, меў заапарк.

У.М.Вяроўкін-Шэлюта.

СЛІМАКІ́, слізнякі, наземныя бруханогія падкл. лёгачных малюскаў пераважна атр. сцяблініставокіх, у якіх няма вонкавай ракавіны або яна недаразвітая. Больш за 250 відаў. Пашыраны амаль па ўсім зямным шары, пераважна лясныя жывёлы. Актыўныя ноччу. На Беларусі найб. пашыраны С.: палявы (Deroceras agreste), сеткаваты (D. reticulatum), вялікі (Limax maximus) з роду арыён (Arion) і інш.

Даўж. цела 15—200 мм. Цела чэрвепадобнае або цыліндрычнае, складаецца з галавы, вантробнага мяшка са скурнай складкай (мантыяй) і нагі. Органы дыхання — лёгачныя мяшкі. Раздзельнаполыя або гермафрадыты. Пераважна расліннаедныя, ёсць драпежнікі (кормяцца глебавымі алігахетамі і інш. відамі малюскаў). Шкоднікі пасеваў. Некат. — прамежкавыя гаспадары паразітаў с.-г. жывёл.



Слімакі: 1 — вялікі; 2 — сеткаваты; 3 — арыён субфускус; 4 — арыён руфус.

СЛІННАКАМЯНЁВАЯ ХВАРО́БА, хранічнае запаленне *слінных залоз* з утварэннем слінных камянёў у вывадных пратоках. Найб. часта бывае С.х. падсківічнай залозы, радзей — калявушной, зрэдку некалькіх залоз адначасова. Прыкметы: боль, прыпухласць залозы, зрэдку ўскладняецца абсцэсамі. Лячэнне хірургічнае.

І.М.Семяненя.

СЛІ́ННЫЯ ЗАЛО́ЗЫ, ротавыя залозы, экзакрынныя залозы, якія адкрываюцца ў ротавую поласць і выпрацоўваюць сліну. У млекакормячых і чалавека акрамя шматлікіх дробных залоз, размешчаных у слізістай абалонцы, у ротавую поласць адкрываюцца пратокі 3 пар буйных С.з. (калявушная, падсківічная і пад'язычная). За суткі чалавек выдзяляе 1,5—2 л сліны, буйныя с.-г. жывёлы — 40—120 л. Сліна мае ў сабе да 99,5% вады, арган. і неарган. злучэнні, аказвае бактэрыцыднае ўздзеянне. Асн. яе функцыя — змочванне ежы для аблягчэння працэсаў жавання і праходжання праз стрававальны канал. Кансістэнцыя і хім. састаў ежы, асаблівасці жыццядзейнасці вызначаюць састаў сліны і характар слінавыдзялення. Напр., сліна змей мае ядавітыя рэчывы і выкарыстоўваецца як сродак аховы і нападзення, сліна некат. птушак багатая на злучэнні, неабходныя пры пабудове гнязда, сліна жывёл-крывасмокаў (камары, кляшчы, п'яўкі) звычайна мае антыкаагулянты, якія прадухіляюць згусальнасць крыві. Слінавыдзяленне ўзнікае рэфлекторна пад уплывам безумоўных (напр., знаходжанне ежы ў ротавай поласці) і ўмоўных (напр., надыход часу прыёму ежы) раздражняльнікаў; у чалавека ўмоўным раздражняльнікам можа быць і слова. На сакрэцыю сліны ўплываюць таксама гармоны гіпофіза, падстраўнікавай, шчытападобнай і палавых залоз. С.з. здольныя выконваць эндакрынныя функцыі (напр., у падсківічнай залозе грызуноў знойдзены фактар росту нерваў, які рэгулюе развіццё сімпатычнай нерв. сістэмы ў арганізме).

А.С.Леанцюк.



У.**Слінчанка**. У XXI стагоддзе. 2000.

СЛІ́НЧАНКА Уладзімір Пятровіч (н. 10.10.1922, с. Будаква Лохвіцкага р-на Палтаўскай вобл., Украіна), бел. скульптар, педагог. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1965), у 1968—94 выкладаў у ім. Гал. месца ў творчасці займаюць помнікі і мемар. знакі воінам Сав. Арміі і бел. партызанам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну, у вёсках Блужа Пухавіцкага (1968), Рачэнь Любанскага (1969), Белічы Слуцкага і Зарэчча Лагойскага (1974) р-наў Мінскай вобл., мемар. комплекс «Бабруйскі кацёл» у Бабруйску (1986, з П.Цомпелем і М.Бакуменка); станковыя кампазіцыі «Заслонаўцы» (1965), «Партызанка» (1966), «Партызаны» (1968); партрэты ветэранаў вайны В.М.Гінтаўта, К.І.Дзьяковіча, М.І.Кімбара, Р.Я.Марука, М.М.Рабцава (1970—80-я г.), партыз. разведчыцы Т.Галабурды (1982) і інш. Аўтар надмагілля нар. артыста СССР Б.Платонава на Усходніх могілках у Мінску (1970), бюстаў Ф.Э.Дзяржынскага ў будынку Мін-ва ўнутр. спраў у Мінску (1984) і К.Маркса ў Віцебску (1985), мемарыяльнай дошкі мастаку М.Сеўруку ў г. Нясвіж (1989), партрэтаў скульптараў З.Азгура, А.Анікейчыка, А.Бембеля, А.Глебава, С.Селіханава (1995—97), кампазіцый «Праметэй» (1998), «У XXI стагоддзе» (2000) і інш.

Э.А.Петэрсон.

СЛІНЯ́ВІЦЫ, сямейства насякомых, гл. *Пенніцы*.

СЛІП (англ. slip літар. — слізганне), 1) пад'ёмна-спускавое збудаванне для кіруемага механізаванага спуску суднаў на ваду (пад'ёму іх з вады) на суднавозных цялежках па рэйкавых пуцях, якія ўкладзены на нахіленай плоскасці. Падводная частка рэйкавых пуцей забяспечвае апусканне цялежак на глыбіню, дастатковую для пастаноўкі на іх (усплывання з іх) судна. 2) Падоўжны нахілены ўчастак верхняй палубы прамысл. судна, які паглыбляецца пад паверхню вады і абмяжоўваецца верт. бакавымі сценкамі. Служыць для пад'ёму з вады трала з уловам і інш. Пачынаецца ад *ватэрлініі* каля кармавога канца судна.

СЛІПЧУ́К Пётр Аляксеевіч (19.1.1914, с. Леніна Жытомірскай вобл., Украіна — 5.11.1979), украінскі паэт, публіцыст, перакладчык. Засл. работнік культуры Украіны (1974). Працаваў на рудніках Данбаса, настаўнічаў. Аўтар сатыр. і гумарыстычных зб-каў «Байкі» (1944), «Людаеды» (1945), «Калоссе і Чартапалох» (1957), «За і супраць» (1963), «Размаляваны слуп» (1964), «Юшка з перцам» (1967), «Смехам па ліху» (1970). На ўкр. мову пераклаў некат. вершы і байкі Я.Купалы. На бел. мову асобныя байкі С. пераклалі У.Паўлаў і Э.Валасевіч.

СЛІЦ Антон Іванавіч (17.5.1894, с. Анзулі Прэйльскага р-на, Латвія — 28.7.1945), Герой Сав. Саюза (1944), ген.-маёр (1944). Беларус. Скончыў Дзвінскую школу прапаршчыкаў (1917), Ваен. акадэмію імя Фрунзе (1943). У Чырв. Арміі з 1918. Удзельнік грамадз. вайны 1918—20, баёў на Паўд., Зах. франтах: камандзір узвода, роты, батальёна. У Вял. Айч. вайну з 1941 на Зах., 2-м Бел. франтах. Удзельнік баёў пад Смаленскам, Вязьмай, Масквой. Дывізія на чале з палк. С. вызначылася ў *Беларускай аперацыі 1944* пры фарсі-

раванні рэк Бася, Дняпро, Друць, забяспечыла поспех у завяршэнні Магілёўскай аперацыі, вызваліла каля 300 нас. пунктаў.



А.І.Сліц.



М.А.Слічэнка.

СЛІЧЭ́НКА Мікалай Аляксеевіч (н. 27.12.1934, г. Белгарад, Расія), спявак (барытанальны тэнар), акцёр, рэжысёр. Нар. арт. СССР (1981). Скончыў Вышэйшыя рэжысёрскія курсы пры Мін-ве культуры Расіі (1972). З 1951 акцёр, з 1970 адначасова рэжысёр, з 1977 гал. рэжысёр Маскоўскага цыганскага т-ра «Рамэн». Сярод роляў: Васіль («Цыганка Аза» М.Старыцкага), Іван Кале («Рамбора» Шведава). Паставіў спектаклі: «Грушанька» М.Штока паводле М.Ляскова (1973; сыграў ролю маладога цыгана, Князя, Галавана), «Мы — цыгане» І.Ром-Лебедзева і С. (1976), «Непаклонаў» М.Мірашнічэнкі (1977; сыграў гал. ролю), «Вогненныя коні» Ром-Лебедзева (1979; роля чытальніка), «Браты» З.Таболкіна (1980), «Жывы труп» Л.Талстога (1984; сыграў ролю Федзі Пратасава) і інш. Выканаўца цыганскіх рамансаў, эстр. песень. Аўтар кн. «Нарадзіўся я ў табары» (2-е выд., 1987). Дзярж. прэмія СССР 1987.

СЛО́ВА ў моўназнаўстве, асноўная структурна-семантычная адзінка мовы. С. называе прадметы, з'явы, дзеянні, прыкметы і выражае розныя адносіны паміж імі. Выступае сродкам выражэння паняццяў пра цэлыя класы аднародных прадметаў і з'яў, адлюстроўвае ступені абстрагаванага пазнання рэчаіснасці, уступае ў сэнсавыя і грамат. сувязі з інш. С., служыць сродкам фарміравання і выражэння думак, выражае пэўныя адчуванні, пачуцці, эмоцыі ўдзельніка моўных зносін да выказанай ці ўспрынятай інфармацыі. Разнастайнасцю функцый С. тлумачыцца дыялектычнае спалучэнне ў ім канкрэтнага і агульнага, прамога і пераноснага значэнняў, наяўнасць іх розных эмацыянальна-экспрэсіўна-ацэначных і стылістычных адценняў, якія набывае С. ў працэсе функцыянавання ў літ. і гутарковай мове. Спалучэнне прамога (устойлівага) і пераноснага (зменлівага) у семантыцы С. дае магчымасць дасягаць узаемаразумення паміж усімі носьбітамі пэўнай мовы, выкарыстоўваць С. як адзінку найменняў новых прадметаў і з'яў, як фактар стварэння яркіх вобразна-выяўл. сродкаў у мове маст. л-ры. На ўжыванні С. ў пераносным значэнні засн. *метафара*, *метанімія*, *перыфраза*, *сінекдаха*, *сінестэзія*; зменлівы элемент значэння ляжыць у аснове маст. прыёмаў адлюстравання рэчаіснасці (*аксімаран*, *алегорыя*, *іронія*, *увасабленне*). У якасці структурнай адзінкі мовы С. характарызуецца як гук ці спалучэнне гукаў. Яму ўласціва семантычная ідыяматычнасць (умоўнасць сувязі гукавога комплексу з пэўным значэннем). У творах маст. л-ры, асабліва ў паэзіі, маст.-выяўл. і экспрэсіўная выразнасць С. падкрэсліваецца і ўзмацняецца гукавой арганізацыяй мовы. На гукавой сугучнасці С. і іх частак засн. *рыфма* і асобныя віды *эўфаніі* (*алітэрацыя*, *анафара*, *асананс*, *гукапераймання*, *эпіфара*). У С. вылучаюць два бакі: план выражэння (знешняя форма) і план зместу (значэнне). Сувязь паміж гэтымі бакамі ў пэўны перыяд існавання мовы можа быць матываванай (напр., «снягір», «лістапад») і нематываванай («рука», «маці»). С. мае грамат. і лексічнае значэнне. Грамат. значэнне ўласціва адначасова цэламу класу ці вял. групе С. (напр., род, лік, склон характэрны для назоўнікаў, трыванне, лад, час, спражэнне — для дзеясловаў). Лексічнае значэнне з'яўляецца індывідуальным, яно непасрэдна суадносіцца з адпаведным паняццем, адрознівае змест кожнага слова ад інш. слоў. Сукупнасць усіх С. пэўнай мовы, яе слоўнікавы склад і ўзровень наз. *лексікай*. Лексіку вывучаюць *лексікалогія*, *граматыка*, *фразеалогія*, *стылістыка* і інш. лінгвістычныя дысцыпліны. Фіксацыяй і сістэматызацыяй лексікі займаецца *лексікаграфія*.

Літ.: Уфимцева А.А. Слово в лексико-семантической системе языка. М., 1968; Виноградов В.В. Избр. труды: Лексикология и лексикография. М., 1977; Тимофеев Л.И. Слово в стихе. М., 1982; Плотников Б.А., Трайковская В.Ф. Дихотомическая лексикология. Мн., 1989; Лексікалогія сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Мн., 1994; Красней В.П. Грані слова. 3 выд. Мн., 1996. *В.П.Красней.*

СЛО́ВА, твор *аратарскай прозы* ў форме прамовы, пропаведзі або паслання; жанр старажытнай пісьменнасці. Блізкае да *казання*, але больш шырокае па значэнні. Паводле зместу, накіраванасці і агульнага характару С. падзяляліся на свецкія і царк.-рэліг., сярод апошніх вылучаліся ўрачыста-панегірычныя і павучальна-дыдактычныя (гл. *Павучанне*). У стараж. рус. і бел. л-ры С. наз. творы розных жанраў: легендарнае паданне «*Слова пра Меркурыя Смаленскага*», апакрыфічнае «Слова пра Адама і Еву», агіяграфічнае «Слова пра жыццё і смерць вялікага князя Дзімітрыя Іванавіча», перакладная аповесць «Слова пра Іасафа царэвіча». Выдатны помнік стараж. л-ры ўсх. славян, у якім спалучаны асаблівасці апавядальнай прозы і гіст. песні, — «*Слова аб паходзе Ігаравым*». Арыгінальнасцю, багаццем вобразна-паэт. мовы, лірызмам вызначаліся С. *Кірылы Тураўскага*. У 16—17 ст. С. царк.-рэліг. характару сталі важным сродкам вострай ідэалаг. барацьбы, набылі некат. асаблівасці *палемічнай літаратуры* (словы-казанні Л.Карповіча, І.Пацея, М.Сматрыцкага). Актуальныя праблемы грамадска-паліт. жыцця краіны закраналіся ў свецкіх С. (прамовы Р.Хадкевіча, Л.Сапегі, «*Прамова Мялешкі*»). *В.А.Чамярыцкі.*

«СЛО́ВА» («Słowo»), польская газета. Выдавалася з 2(14).1 да 21.2(5.3).1859 у Пецярбургу штодзённа. Выдавец І.*Агрызка*. З дэмакр. пазіцый асвятляла пытанні сял., міжнар. жыцця, асветы. Надрукавала вершы У.Сыракомлі, А.Чайкоўскага, матэрыялы пра літ. дзейнасць Г.Марцінкевіча. У «С.» супрацоўнічалі Ю.Барташэвіч, М.Балінскі, З.Жалігоўскі (А.Сава), З.Серакоўскі, У.Спасовіч, У.Сыракомля, магчыма, В.Каліноўскі (брат К.Каліноўскага). З газетай быў звязаны бел. паэт Я.Вуль. Забаронена за публікацыю ліста польскага гісторыка І.Лялевеля. *В.Ф.Шалькевіч.*

«СЛО́ВА АБ ПАХО́ДЗЕ ІГАРАВЫМ», «Слова аб палку Ігаравым», «Слова пра паход Ігаравы» («Слово о плъку Игоревѣ, Игоря, сына Святъславля, внука Ольгова»), помнік літаратуры Кіеўскай Русі 12 ст. Узнік на аснове агульнай культуры рус., бел. і ўкр. народаў. Створаны, верагодна, у канцы 1185—86 у Кіеве. Аўтар невядомы. У «Слове» апавядаецца пра няўдалы паход на полаўцаў у 1185 ноўгарад-северскага кн. Ігара Святаславіча (1151—1202). Паэт. апісанне паходу, бітвы і паражэння перарастае ў творы ва ўсхваляванае, пранікнёнае і праўдзівае слова пра Радзіму, напоўненае глыбокім роздумам і трывогай за лёс роднай зямлі і яе народа. Прычыны няўдач, аслаблення ваенна-паліт. магутнасці Русі аўтар бачыў у абставінах, якія склаліся на ўсх.-слав. землях ва ўмовах феад. раздробленасці, у княжацкіх міжусобіцах, адсутнасці згоды і адзінства, няспынных нападах знешніх ворагаў. Асуджаючы своекарыслівыя паводзіны князёў, паэт заклікае іх спыніць сварку і паслужыць агульнай справе ўмацавання абароны ўсёй Русі, аднаўлення паліт. аўтарытэту і магутнасці стольнага Кіева. Змест і вобразы паэмы цесна звязаны з рэальна-гіст. жыццём сярэдневяковай Русі і сведчаць пра шырокі кругагляд яе аўтара, пра яго глыбокую дасведчанасць у складанай гісторыі ўсх.-слав. зямель і княстваў, якую ён паказаў з вял. аб'ектыўнасцю і дакладнасцю. Разнастайныя звесткі «Слова», аўтарскія апісанні падзей і дзейнасці гіст. асоб у цэлым не супярэчаць інш. тагачасным пісьмовым крыніцам, у прыватнасці летапісам, а месцамі ўдакладняюць і дапаўняюць іх. Твор — каштоўная крыніца пазнання далёкай мінуўшчыны ўсх. славян, у т.л. Беларусі. Яркай гіст. асобай, мудрым і

дзейным валадаром, князем-чарадзеем і адначасова несправядліва пакрыўджаным, няшчасным чалавекам паказаны ў «Слове» легендарны Усяслаў Брачыславі́ч, намаляваны ў духу вусна-паэт. нар. традыцый з цеплынёй і спачуваннем. Уражвае сваім трагізмам і трапнасцю маст. апісання *Нямі́гская бі́тва 1067*. Значная ўвага, аддадзеная ў паэме Полацку і яго мінуламу, сведчыць пра важную ролю Полацкага княства ў гісторыі ўсх. славян, пра яго цесныя і даўнія ўзаемасувязі з Кіеўскай Руссю. Старонкі, прысвечаныя полацкім князям, у цэлым сугучныя агульнаму элегічнаму тону паэмы. Фінал «Слова» аптымістычны, напоўнены глыбокай верай у будучыню роднай зямлі і свайго народа. Аўтар выступаў з высокай грамадзянска-патрыят. і гуманіст. пазіцыі, выявіў агульнанар. погляды і імкненні таго часу. Твор — своеасаблівая энцыклапедыя Стараж. Русі, багатая крыніца пазнання тагачасных светапогляду, культуры і побыту. У яго мове адлюстраваліся асобныя рысы жывой гаворкі тагачаснай Чарнігава-Северскай зямлі, бел.-ўкр. моўнага сумежжа, дзе, верагодна, жыў і працаваў аўтар паэмы. Скарбы бел. мовы дапамагаюць больш дакладна зразумець і вытлумачыць некат. т.зв. цьмяныя месцы «Слова», якое змяшчае нямала т.зв. беларусізмаў. Высокая маст. дасканаласць, багацце і самабытнасць вобразаў, музычнасць паэт. мовы, публіцыст. пафас і ўзнёсласць, незвычайная змястоўнасць і праўдзівасць, глыбіня думкі і тонкі лірызм, падпарадкаваныя высокай ідэі, робяць твор помнікам неўміручага ідэйна-маст. гучання, маст. шэдэўрам сусв. значэння. Паэма паўплывала на л-ры ўсх.-слав. народаў, сцвярджаючы традыцыі народнасці і патрыятызму.

«Слова» адкрыў у пач. 1790-х г. рус. гісторык А.Мусін-Пушкін у рукапісе 16 ст., які зберагаўся ў Яраслаўлі і загінуў у Маскве ў 1812. Упершыню тэкст «Слова» апублікаваны ў 1800. Паэтычнасць, маст. сіла і глыбокая ідэйнасць гэтага твора паланілі А.Міцкевіча і У.Сыракомлю, Я.Купалу і М.Багдановіча, пісьменнікаў, мастакоў, вучоных розных народаў. У ліку першых даследчыкаў «Слова» быў З.Даленга-Хадакоўскі. У 1910 паэт. пераклад урыўка паэмы пра смерць полацкага кн. Ізяслава зрабіў Багдановіч. Першыя поўныя празаічныя пераклады на бел. мову належаць Я.Купалу (1919) і М.Гарэцкаму (каля 1920), у 1921 Я.Купала ажыццявіў адзін з найлепшых вольных паэт. перакладаў «Слова». Сярод апошніх бел. перакладаў — вольны пераклад Я.Крупенькі (нап. 1966 —79, апубл. часткова 1976, цалкам 1994), дакладны і паэт. пераклад Р.Барадуліна (1984—85).

Публ.: Слово о полку Игореве // Литературные памятники. М.; Л., 1950; Слово о полку Игореве. Л., 1985 (Б-ка поэта); Бел. пер. — Слова пра паход Ігаравы. Мн., 1986.

Літ.: Рыбаков Б.А. «Слово о полку Игореве» и его современники. М., 1971; Лихачев Д.С. «Слово о полку Игореве»: Ист.-лит. очерк. 2 изд. М., 1982; Я г о ж. «Слово о полку Игореве» и культура его времени. 2 изд. Л., 1985; Вечна жывое «Слова». Мн., 1989; Виноградова В.Л. Словарь-справочник «Слова о полку Игореве». Вып. 1—6. М.; Л., 1965—84; Булахов М.Г. «Слово о полку Игореве» в литературе, искусстве, науке. Мн., 1989; Энциклопедия «Слова о полку Игореве». Т. 1—5. СПб., 1995.

В.А.Чамярыцкі.

«СЛО́ВА І СПРА́ВА ГАСУДА́РАВА», сістэма паліт. вышуку ў Расіі 17—18 ст. Пашырылася з часоў царавання *Міха́іла Фёдаравіча* [1613—45]. Кожны падданы пад страхам смерці абавязаны быў данасіць уладам пра вядомыя яму злыя намеры супраць цара або членаў яго сям'і, аб знявазе царскага імя і тытула, аб дзярж. здрадзе. Пры гэтым ужываўся ўмоўны выраз: «Слова і справа гасудара!» або проста «Слова і справа!». Даносчыка і абгавораных ім людзей падвяргалі перакрыжаваным допытам і катаванням. Такія справы разглядалі ў Разрадным, Разбойным, Стралецкім і інш. прыказах; з 1702 — у Праабражэнскім прыказе, у 1721—26 — у Тайнай канцылярыі, у 1731—62 — у Канцылярыі тайных і вышуковых спраў. Адменена ў 1762.

Літ.: Семевский М.И. Тайная служба Петра I. Мн., 1993.

«СЛО́ВА ПРА МЕРКУ́РЫЯ СМАЛЁНСКАГА», «Аповесць пра Меркурыя Смаленскага», помнік стараж. л-ры ўсх. славян. Узнікла як нар. эпічнае паданне пасля мангола-татарскага нашэсця (верагодна, у 2-й пал. 13—14 ст.), літаратурна апрацавана ў 15 ст. Падставай узнікнення падання паслужыў той факт, што мангола-татары не змаглі заваяваць Смаленскую зямлю і не разрабавалі Смаленск, гэта было вытлумачана заступніцтвам Меркурыя — абаронцы хрысціян ад ворагаў (у яго асобе аб'ядналіся рысы нар. волата і блажэннага). Аповесць блізкая да твораў гіст.-агіяграфічнага жанру, напісана лірычна, усхваляванa, асабліва вылучаюцца маналогі-плачы Смаленскай зямлі па воінах, што загінулі. Твор мясц. паходжання, мова царк.-славянская. Вядома каля 80 спісаў, найб. раннія датуюцца 16 ст. Першая, самая стараж. паводле паходжання, рэдакцыя захавалася ў адзіным спісе 17 ст. «Слова...» адкрыў і даследаваў у 19 ст. Ф.Буслаеў.

Публ.: Памятники литературы Древней Руси, XIII в. М., 1981.

Літ.: Белецкий Л.Т. Литературная история повести о Меркурии Смоленском. Пг., 1922.

«СЛО́ВА ПРА́ЦЫ», газета рэвалюцыйна-дэмакратычнага кірунку. Выходзіла з 5 да 31.10.1928 у Вільні на бел. мове. Асвятляла паліт. і эканам. становішча зах.-бел. працоўных, паказвала ўзмацненне рэпрэсій польскіх улад супраць народаў нац. ускраін пасля выбараў у польскі сейм і сенат. Шмат увагі аддавала барацьбе вучняў Віленскай бел. гімназіі супраць паланізацыі зах.-бел. народа, бел. школы. Пісала пра сял. забастоўкі, дзейнасць Т-ва бел. школы, пра яго барацьбу за нац. адраджэнне бел. народа. Друкавала маст. творы, вершы М.Васілька. Выйшла 9 нумароў, 5 канфіскаваны. Закрыта польскімі ўладамі.

С.В.Говін.

СЛОВАЗЛУЧЭ́ННЕ, свабоднае сэнсавае і фармальнае аб'яднанне двух і болей паўназначных слоў, якое служыць для выражэння адносін паміж паняццямі, што абазначаны гэтымі словамі. Напр., «сонечны дзень», «бегчы лесам», «нехта з супрацоўнікаў рэдакцыі». У адрозненне ад сказа не мае прэдыкатыўнага значэння, не перадае закончанага выказвання. У маўленні С. выступае ў якасці часткі паведамлення. Найб. агульныя разрады С. вылучаюцца на падставе колькасці аб'яднаных слоў (двухслоўныя, ці простыя, і шматслоўныя, ці складаныя) і тыпу адносін паміж імі (спалучальныя і падпарадкавальныя). Утварэнне і ўжыванне спалучальных С. («гарады і вёскі», «слухаў, але не рэагаваў») падпарадкоўваюцца правілам функцыянавання *аднародных членаў сказа*. Падпарадкавальныя С. па ступені злітнасці кампанентаў падзяляюцца на сінтаксічна свабодныя і сінтаксічна несвабодныя («пераплёты кніг» — «некалькі кніг»). У залежнасці ад галоўнага слова вылучаюць С. дзеяслоўныя («скласці план»), назоўнікавыя («папера для чарчэння»), прыметнікавыя («варты ўзнагароды»), прыслоўныя («далёка ад дому»), лічэбнікавыя («трое ў шынялях»). Усе падпарадкавальныя С. маюць бінарную структуру, падзяляюцца на гал. частку і залежную («ліст ад маці», «стары ясень каля нашай хаты»). У бел. мове выкарыстоўваюцца 3 асн. спосабы пабудовы падпарадкавальных С.: *дапасаванне*, *кіраванне*, *прымыканне*. Сродкі выражэння падпарадкавання: флексіі, службовыя словы, словапарадак і інтанацыя (у сказе).

Літ.: Міхневіч А.Я. Сінтаксічна непадзельныя словазлучэнні ў беларускай мове. Мн., 1965; Падгайскі Л.П. Словазлучэнне ў беларускай мове. Мн., 1971; Наркевіч А.І. Сістэма словазлучэнняў у сучаснай беларускай мове. Мн., 1981; Бандарэнка Т.П. Аднатыпныя словазлучэнні ў сучаснай беларускай літаратурнай мове. Мн., 1981; Беларуская граматыка. Ч. 2. Сінтаксіс. Мн., 1986.

А.Я.Міхневіч.

СЛОВАЗМЯНЁННЕ, утварэнне граматычных форм таго самага слова, якія выражаюць яго адносіны да інш. слоў у сказе і, адпаведна, адносіны паміж пэўнымі паняццямі, з'явамі, што абазначаюцца гэтымі словамі (параўн. **«стол** стаіць», «няма **стал-а**», «ляжыць на **стал-е**»).

Сродкі С. — словазменныя (сінтаксічныя) марфемы, якія і выяўляюць сінтакс. залежнасць адных слоў ад другіх у маўленчай плыні. У бел. мове да гэтых марфем адносяцца гал. чынам флексіі (канчаткі), што далучаюцца да формаўтваральных асноў. Пры дапамозе флексій утвараюцца склонавыя формы ўсіх

скланяльных слоў (назоўнікаў, прыметнікаў, лічэбнікаў, займеннікаў), формы роду і ліку прыметнікаў, займеннікаў, дзеепрыметнікаў, асабовыя формы дзеясловаў у розных часах і ладах. Шырокае выкарыстанне флексій як сродкаў С. вызначае флектыўны характар бел. мовы (як і блізкароднасных рус. і ўкр. моў). Многія сучасныя даследчыкі С. адрозніваюць ад яго *формаўтварэнне*. Аднак часта С. і формаўтварэнне не размяжоўваюцца і супрацьпастаўляюцца як агульная з'ява *словаўтварэнню*.

Літ.: Виноградов В.В. О формах слова // Виноградов В.В. Избр. тр.: Исслед. по рус. грамматике. М., 1975; Герд А.С. Словообразование, формообразование и словоизменение // Лингвистика и модели речевого поведения. Л., 1984; Беларуская граматыка. Ч. 1. Мн., 1985. *Л.М.Шакун.*

СЛОВАСКЛАДА́ННЕ, марфалагічны спосаб *словаўтварэння* шляхам складання двух ці больш слоў або ўтваральных асноў. У сучаснай бел. мове вылучаюць *складаныя словы*, утвораныя шляхам складання слоў (уласна С.) і складання асноў (асноваскладанне). Пры С. аб'ядноўваюцца 2 граматычна аформленыя лексічныя адзінкі, сярод якіх вылучаюцца раздзельнааформленыя (абедзве часткі слова маюць грамат. формы словазмянення — «сцежкі-дарожкі») і цэласнааформленыя (маюць толькі адну, звычайна апошнюю, словазмяняльную частку — «плашч-палатка», «вечназялёны»). У сучаснай бел. мове слоў, утвораных шляхам С., параўнальна нямнога. Значна больш складаных слоў, утвораных шляхам асноваскладання. Іх падзяляюць на 2 падгрупы лексем: у 1-й адна частка складанага слова з'яўляецца ўтваральнай асновай, а другая — утваральным словам («нов-а-будоўля» ад «нов-(ая) будоўля»); у 2-й — словы, утвораныя шляхам складання асноў і суфіксацыі (складанасуфіксальныя словы: «ціх-а-акіян-ск-(і)» ад «Ціх-(і) акіян»). Разнавіднасць С. — утварэнне складанаскарочаных слоў або *абрэвіятур*. С. — адзін з найб. актыўных спосабаў папаўнення слоўнікавага складу мовы, асабліва характэрна для розных галін навук. і тэхн. тэрміналогіі.

Літ.: Шакун Л.М. Словаўтварэнне. Мн., 1978. *А.А.Лукашанец.*

СЛОВАЎТВАРЭ́ННЕ, 1) утварэнне новых слоў (словатворчасць) ад аднакаранёвых слоў або ад словазлучэнняў спосабамі, прынятымі ў пэўнай мове. У бел. мове б.ч. новых слоў утвараецца шляхам афіксацыі — далучэння да ўтваральнай асновы суфікса («трактар — трактар-ыст»), прыстаўкі («магутны — звыш-магутны») або іх разам («мяжа — уз-меж-ак»). Прадуктыўнае складанне — аб'яднанне ў *складанае слова* слоў ці іх асноў («новая будоўля — новабудоўля») або толькі частак слоў ці пачатковых літар і гукаў, т.зв. *абрэвіятур* («Мінскі аўтамабільны завод — МАЗ»). Радзей узнікаюць словы за кошт пераходу слоў з адной часціны мовы ў другую (напр., прыметніка ў назоўнік — «хворы чалавек — хворы ачуняў»), пераасэнсавання значэння слова («куль» — вялікі рагожны мяшок і задняя частка рыбалоўнай снасці). С. — найважнейшая крыніца ўзбагачэння слоўніка мовы, гал. шлях узнікнення тэрмінаў. С. супрацьстаіць *формаўтварэнню* і *словазмяненню*. 2) Раздзел моўнавазнаўства, які вывучае словаўтваральную сістэму мовы. Уключае марфеміку (вучэнне пра значымыя часткі слова — марфемы) і ўласна С. (вывучае структуру і значэнне вытворных слоў, сродкі і спосабы іх утварэння, спосабы групоўкі вытворных слоў у словаўтваральныя тыпы, рады і гнёзды; ступень рэгулярнасці і прадуктыўнасці словаўтваральных сродкаў — фармантаў і тыпаў — на сучасным этапе і ў гіст. развіцці бел. мовы).

Літ.: Сцяцко П.У. Беларускае народнае словаўтварэнне. Мн., 1977; Шакун Л.М. Словаўтварэнне. Мн., 1978; Беларуская граматыка. Ч. 1. Мн., 1985. *П.У.Сцяцко.*

«СЛОВ'ЯНСЬКЕ ВІЧЕ — XXI СТОЛІ́ТТЯ», міжнародны літ.-маст. і грамадска-паліт. альманах. Выдаецца з сак. 1995 у Кіеве на ўкр. мове штоквартальна. Творы бел. і рус. аўтараў друкуе на мове арыгінала, інш. слав. аўтараў — у перакладзе. Мае раздзелы: «Паэзія», «Проза», «Публіцыстыка», «Крытыка», «Мастацтва», «Дзелавы клуб», «Дзецям» і інш. Асвятляе пытанні грамадска-паліт. і культ. жыцця краіны. Выступае за духоўнае аб'яднанне славян, адраджэнне традыцый узаемасувязей слав. л-р. Змяшчае творы і пераклады сучасных слав. аўтараў, літ.-крытычныя артыкулы і рэцэнзіі, архіўныя публікацыі, успаміны, лісты, артыкулы па мастацтве і інш. Друкуе творы ўкр. дыяспары, знаёміць з новымі кнігамі і імёнамі.

СЛОЙ, слоік, у беларусаў ганчарны выраб; высокая пасудзіна з пукатымі, радзей прамымі бакамі і шырокім горлам, з прамымі (пад накрыўку) ці расхіленымі (каб абвязваць паперай або тканінай) беражкамі. Часам меў адно або два вушкі. Памеры ад 0,5 да 20 л. У вял. С. салілі агуркі, грыбы, капусту, мачылі яблыкі, у сярэдніх і маленькіх захоўвалі мёд, тлушч, смятану, варэнне і інш. прадукты. Выраблялі С. паліваныя, часам з ангобнай размалёўкай.



Слаі.

СЛОЙ у геалогіі, геалагічнае цела плоскай формы, складзенае з аднаўзроставых парод (пераважна з асадкавых і вулканагенна-асадкавых, радзей метамарфічных) і абмежаваных з бакоў рознаўзроставымі паверхнямі; стратыграфічная адзінка гарызонту, світы. Плошча пашырэння С. значна перавышае яго таўшчыню (магутнасць). С. з'яўляецца асноўным элементам слаістай структуры асадкавых тоўшчаў. Літалагічны склад яго можа мяняцца па плошчы. С. бываюць кантрастныя (напр., тэкстура адкладаў), паступова зменлівыя ці малапрыкметныя (напр., колер, ажалязненне, акрамяненне, зярністасць, уключэнні арган. рэшткаў і інш.). Гл. таксама *Слаістасць горных пород*. *В.І.Ярцаў.*

СЛО́НАЎ Іван Арцем'евіч (3.6.1882, Масква — 19.9.1945), рускі акцёр. Нар. арт. Расіі (1938). Скончыў Маскоўскае вучылішча жывапісу, скульптуры і дойлідства, вучыўся на акцёрскім аддзяленні Маскоўскай філармоніі. На сцэне з 1903 (запрошаны ў Віцебскі т-р). З 1904 у Т-ры В.Камісаржэўскай у Пецярбургу, у 1906—15 у правінцыяльных тэатрах, вядучы акцёр тэатраў Адэсы і Кіева. З 1915 у Саратаўскім т-ры, на развіццё якога значна паўплываў. Акцёрскае мастацтва С. вылучалася майстэрскім спалучэннем пачуццяў з тонкім псіхал. аналізам. Сярод роляў: Фердынанд («Каварства і каханне» Ф.Шылера), Гамлет («Гамлет» У.Шэкспіра), Хлестакоў («Рэвізор» М.Гогаля), Арбенін («Маскарад» М.Лермантава), Гай («Мой сябар» М.Пагодзіна), Швандзя («Любоў Яравая» К.Транёва), Мікалай I, Пушкін («Дзекабрысты», «Паэт і цар» М.Лернера) і інш. Выступаў як рэжысёр. Займаўся пед. дзейнасцю (з 1916).

Літ.: Слонова Н.И. Честь актерская: И.А.Слонов на сцене и в жизни. М., 1966.

СЛО́НІКІ, даўганосікі (Curculionidae), сямейства падатр. разнаедных жукоў. 2 аддзелы: даўгахобатныя (Phanerognatha; найб. старажытныя паявіліся ў раннім мезазоі), каратхобатныя (Adelognatha; узніклі ў сярэдзіне мезазою). Да 45 тыс. відаў. Трапляюцца на раслінах, у гнілой драўніне, каля вады. На Беларусі 395 відаў, пераважаюць даўгахобатныя; найб. распаўсюджаны: *бураковы даўганосік*, *свірнавы даўганосік*, канюшынавы семяед (Apion apricans), скрытнахобатнік каранёвы капусны (Ceutorrhynchus pleurostigma), С. клубеньчыкавы (Sitona), а таксама кветаеды — яблыневы (Anthonomus pomorum), малінавы (A. rubi); у лясах С. вял. хваёвы (Hylobius abietis), смалёўка хваёвая (Pissodes pini), пладажыл арэхавы (Curculio nucum).

Даўж. ад некалькіх да 60 мм (у тропіках). Цела — ад шара- да палачкападобнай формы, укрытае валаскамі або лусачкамі, якія ўтвараюць стракаты малюнак. Галава выцягнута ў галаватрубку, на канцы якой грызучыя ротавыя органы. У даўгахобатных С. галаватрубка даўжэйшая за галаву, іншы раз за ўсё цела, тонкая, часта патончаная на канцы. У



Да арт. **Слонікі**: 1 — семяед канюшынавы; 2 — слонік паласаты; 3 — слонік шэры бураковы; 4 — слонік вялікі хваёвы; 5 — кветаед яблыневы; 6 — смалёўка хваёвая; 7 — скрытнахобатнік каранёвы капусны; 8 — кветаед малінавы.

караткахобатных С. галаватрубка не даўжэйшая за асн. ч. галавы, амаль заўсёды простая, не патончаная на канцы. Крылы ў большасці добра развітыя, многія караткахобатныя С. іх не маюць. Лічынкі бязногія, белыя, укрытыя рэдкімі валасамі, з жоўта-карычневай галавой і грызучымі сківіцамі. Жукі і іх лічынкі кормяцца травяністымі і дрэвава-кустовымі раслінамі. Шкоднікі многіх культур, расл. прадуктаў і тэхн. драўніны.

СЛО́НІМ, горад, цэнтр Слонімскага р-на Гродзенскай вобл., на р. Шчара пры ўпадзенні ў яе р. Іса. Чыг. ст. на лініі Баранавічы—Ваўкавыск; вузел аўтадарог на Баранавічы, Івацэвічы, Ружаны, Зэльву, Дзятлава. За 143 км ад Гродна. 51,6 тыс. ж. (2001).

Паводле археал. даследаванняў, горад узнік у 11 ст. на месцы невял. паселішча. Упершыню ўпамінаецца ў Іпацьеўскім летапісе пад 1252. У 1254 уваходзіў у *Галіцка-Валынскае княства*. З 2-й пал. 13 ст. ў ВКЛ. З канца 13 ст. ў С. быў умацаваны замак (гл. *Слонімскія замкі*), вакол якога рос горад. Слонімская харугва прымала ўдзел у *Грунвальдскай бітве 1410*. Пасля *Гарадзельскай уніі 1413* С. уключаны ў Трокскае ваяв. У 1531 С. атрымаў ад вял. кн. Жыгімонта I Старога самакіраванне паводле магдэбургскага права; пацверджана ў 1591 Жыгімонтам III (тады ж дадзены герб: залаты леў з падвойным сярэбраным крыжам на блакітным полі) і ў 1679 Янам III Сабескім, у 1776 скасавана. З 1560 належаў маршалку Р.Валовічу, з 1586 — канцлеру ВКЛ Л.Сапегу, з 1655 — князям Агінскім. У выніку вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—67 горад заняпаў. Яго эканам. ўздым звязаны з дзейнасцю слонімскага старосты Міхала Казіміра *Агінскага*, вял. гетмана літ., які ў 2-й пал. 18 ст. заснаваў тут сваю рэзідэнцыю, стварыў *Слонімскую друкарню*, *Слонімскую капэлу Агінскага*, *Слонімскі беларускі драматычны тэатр*. У 14—15 ст. фарміравалася забудова пасада, у С. было 9 цэркваў. У 16 ст. на месцы разбуранага замка пабудаваны драўляны палац, перад якім сфарміравалася гандл. плошча (цяпер вул. Першамайская), да якой сыходзіліся асн. вуліцы. У 17—18 ст. узведзены шэраг мураваных кляштараў, храмаў і інш. пабудоў, якія ўвайшлі ў сістэму абарончых умацаванняў: касцёл дамініканцаў, калегіум езуітаў (не захаваліся), кляштар бенедыкці-

Слонімскі тэатр Агінскага, пры якім працавалі *Слонімская балетная школа*, *Слонімская музычная школа*, пабудаваў Слонімскія мануфактуры дываноў (гл. ў арт. *Слонімскія мануфактуры*), *Агінскі канал* і інш. З 1795 С. у складзе Рас. імперыі, цэнтр *Слонімскай губерні*, з 1797 у Літоўскай, з 1801 у Гродзенскай губерні, цэнтр *Слонімскага павета*. У вайну 1812 каля С. 20 кастр. адбыўся бой паміж рас. і франц. войскамі. У 1897 у С. 15 893 ж., 1312 жылых дамоў, у т.л. 333 мураваныя, 5 піваварных, 4 ганчарныя, 2 гарбарныя з-ды, 2 канатныя ф-кі, некалькі млыноў, 2-класнае павятовае вучылішча, прыходскае вучылішча, пачатковае яўр. вучылішча, прыватны жаночы пансіён, 2 царквы, 2 касцёлы, 7 сінагог, мячэць. У пач. 20 ст. адкрыты *слонімскія гімназіі* і Слонімскае рэальнае вучылішча. Вял. ролю ў развіцці прам-сці горада ў 19 — пач. 20 ст. адыгралі буйныя землеўладальнікі графы Пуслоўскія, якія ў прыгарадзе С. — *Альбярціне* адкрылі медную, дывановую, лесапільную мануфактуры, *Альбярцінскую суконную фабрыку* і інш. У 19 ст. створана *Слонімская сядзіба «Альбярцін»*. У 1921—39 у складзе Польшчы, павятовы цэнтр Навагрудскага ваяв. З 1939 у БССР, з 15.1.1940 цэнтр *Слонімскага раёна* Баранавіцкай вобл. 26.6.1941 акупіраваны нямецкімі фашыстамі, якія загубілі ў горадзе і раёне 42 тыс. чал., у т.л. ў С. больш за 10 тыс. чал. Дзейнічала *Слонімская раённая антыфашысцкая арганізацыя*. 10.7.1944 вызвалены войскамі 1-га Бел. фронту ў ходзе наступлення на Баранавіцка-Брэсцкім напрамку. З 8.1.1954 С. — цэнтр раёна Гродзенскай вобл., з 7.3.1963 горад абл. падпарадкавання. У 1973 — 32,5 тыс. ж. З 1990 у С. працуе *Слонімскі беларускі драматычны тэатр*.







Слонім. Гарадскія асабнякі 19 — 1-й пал. 20 ст.

нак, *Слонімскі кляштар канонікаў латэранскіх*, *Слонімскі касцёл і кляштар бернардзінак*, *Слонімскі касцёл і кляштар бернардзінцаў*, *Слонімская сінагога*, *Слонімская капліца Дамініка*, *Слонімскі Андрэеўскі касцёл*, аўстэрыя і ратуша (барока). З 2-й пал. 18 ст. забудова горада фарміравалася вакол звязаных паміж сабою плошчаў: гал. гандлёвай, перад касцёлам дамініканцаў (цяпер пл. Леніна) і перад сінагогай. Вуліцы (пераважна брукаваныя) накіраваны да гандл. плошчы. У 19 ст. распрацаваны праекты перапланіроўкі С., якія прадугледжвалі захаванне гіст. планіровачнай структуры горада. Паводле іх пабудаваны 2—3-павярховыя цагляныя дамы ў цэнтры горада. Захаваліся фрагменты харектэрнай для пач. 18 — пач. 20 ст. жылой забудовы, гар. асабнякі 19—20 ст. У стылі мадэрн — *Слонімскага вакзала будынак*, банк. У пас. Фабрычны (уключаны ў межы горада) — *Слонімская сядзіба «Альбярціна»*. Сучасны горад размешчаны абапал р. Шчара. Генпланы С. распрацаваны ў 1963 (ін-т «Белдзяржпраект», арх. Л.Васільеў, С.Мамаева, карэкціроўка 1966) і 1973 (Мінскі філіял ЦНДІПгорадабудаўніцтва, арх. А.Агафонава, карэкціроўка БелНДІПгорадабудаўніцтва 1987, арх. Т.Татарынцава). У 1980 зроблены праект дэталёвай планіроўкі цэнтра (БелНДІПгорадабудаўніцтва, арх. Татарынцава). Паводле генплана 1999 (БелНДІПгорадабудаўніцтва, арх. У.Ісачанка, Татарынцава, Ю.Чантурыя, пры ўдзеле арх. А.Пархуты, У.Казырновіча) гар. тэрыторыі пашыраюцца на Пд і ПдЗ, ствараецца новы грамадскі цэнтр. Зона адпачынку — р. Шчара, канал Агінскага з паркам, парк у пас. Фабрычны, воз. Лабазоўка.

Працуюць акц. т-ва «Слоніммэбля», *Слонімскі кардонна-папяровы завод*, *Слонімская камвольна-прадзільная фабрыка*, *Слонімская фабрыка мастацкіх вырабаў*, ф-ка «Гасцінічная мэбля», вінзавод, камбінат быт. абслугоўвання і інш.; 10 сярэдніх і базавая (санаторна-лясная) школа, муз. школа, 7 б-к, раённы Дом культуры, *Слонімскі краязнаўчы музей*. Брацкія магілы сав. воінаў і партызан, помнік Вызваліцелям. У навакольлі горада 3 магілы і могілкі яўрэяў — ахвяр фашызму.

Літ.: Мелешко В.И. Слоним: Ист. очерк. Мн., 1962; Караткевіч В.Б., Кулагін А.М. Помнікі Слоніма. Мн., 1983; Цеханавецкі А. Міхал Казімір Агінскі і яго «сядзіба музаў» у Слоніме: Пер. з ням. Мн., 1993; Супрун В. За смугою часу. Мн., 1994; Яго ж. Дзеі пад Шчарай. Слонім, 2000.

М.Б.Батвіннік (гісторыя), *Ю.У.Чантурыя* (архітэктура).

СЛО́НІМСКАГА ВАКЗА́ЛА БУДЫ́НАК, помнік архітэктуры ў г. Слонім Гродзенскай вобл. Пабудаваны ў 1922 з цэглы. У архітэктуры выкарыстаны стылізаваныя элементы барока. Прамавугольны ў плане мураваны будынак з мансардавым дахам складанага пластычнага малюнка. Прасторавае развіццё кампазіцыі дасягаецца 3-ступеньчатым павышэннем аб'ёмаў, якое нарастае да цэнтра: ад адносна нізкіх бакавых крылаў праз цэнтр. аб'ём да мансардавага паверха. Франтальныя фасады маюць па цэнтры 2-павярховыя рызаліты з фігурнымі франтонамі, дэкарыраванымі валютамі, шарамі на пастаментах, філянговымі парапетамі. 1-павярховы аб'ём уваходнага тамбура завершаны «разарваным» франтонам. Фасады дэкарыраваны рустам, расчлянёны прамавугольнымі і арачнымі высокімі аконнымі і дзвярнымі праёмамі. *А.М.Кулагін.*



Слонім. Дом культуры.

СЛО́НІМСКАЕ ЎЗВЫ́ШША. На З Беларусі, у паўд. ч. Гродзенскай і паўн. ч. Брэсцкай абласцей; у складзе *Паўднёва-Заходняга адгалінавання Беларускай грады*. Мяжуе з Верхнянёманскай нізінай на Пн, Ваўкавыскім і Навагрудскім узвышшамі на З і У (аддзелена ад іх далінамі рэк Зальвянка і Шчара), Баранавіцкай раўнінай на Пд. Найб. выш. 228 м. Працягнулася з ПнЗ на ПдУ на 65 км, шыр. да 42 км. Пл. каля 2 тыс. км^2.

У тэктанічных адносінах прымеркавана да Цэнтральнабеларускага масіву *Беларускай антэклізы*. У рэльефе фундамента вылучаюцца Слонімскі купал і Зальвянская брахіантыкліналь. Найб. магутнасці платформавага чахла (300—350 м) прымеркаваны да паўд. і зах. схілаў Бел. антэклізы, найменшыя (150 м) — да купалападобных падняццяў. Чахол складзены з адкладаў верхняга пратэразою, мелавога, палеагенавага і неагенавага ўзросту. Дантрапагенавая паверхня моцна парэзаная (амплітуда расчлянення да 100 м). Трапляюцца ледавіковыя лагчыны з адзнакамі днішча да -20 м. У антрапагенавай тоўшчы (магутнасць да 160 м) вылучаны 4 гарызонты (нараўскі, бярэзінскі, дняпроўскі, сожскі). Фарміраванне С.ў. адбылося пад уплывам дняпроўскага ледавіка (перапрацоўка глыбокіх адорвеняў мелавых, палеагенавых і раннеантрапагенавых адкладаў), сучасны рэльеф створаны *сожскім зледзяненнем*.

Рэльеф С.ў. буйнаўзгорысты і градава-ўзгорысты. У цэнтры спадзістая слабахвалістая раўніна. Грады выцягнуты з ПнЗ на ПдУ, сярод іх вылучаны Залацееўскі пояс град і Косаўская града. Рэльеф моцна тэхнагенна пераўтвораны. Карысныя выкапні: гліны лёгкаплаўкія, пясчана-жвіровы матэрыял, буд. пяскі. На З С.ў. дрэніруецца правымі прытокамі р. Зальвянка (Трасцянка, Іванаўка), на Пд і У — левымі прытокамі р. Шчара (Грыўда, Шэя, Валобрынка, Бяроза, Луконіца, Сіпа). У межах узвышша воз. Бяздоннае. Частка былых азёрных катлавін ператварылася ў нізінныя балоты. Глебы пераважна дзярнова-падзолістыя, слаба- і сярэднеападзоленыя, алювіяльныя поймавыя, па паніжэннях і лагчынах намыўныя пераўвільготненыя. Пад лесам каля 28% тэрыторыі. Лясы захаваліся асобнымі масівамі. Найб. пашыраны лясы шыракаліста-яловыя, ялова-грабавыя, дубровы з ясенем, вязам і клёнам, ельнікі з дамешкам дубу, грабу і ліпы, хвойнікі баравыя і субаравыя з дамешкам елкі, дубу. *В.М.Фядзеня.*



Слонімскага вакзала будынак.

СЛО́НІМСКАЯ БАЛЕ́ТНАЯ ШКО́ЛА. Дзейнічала ў 2-й пал. 18 ст. ў г. Слонім Гродзенскай вобл. пры *Слонімскім тэатры Агінскага*. З 1777 існаваў невял. балетны ансамбль (8 чал.), падрыхтаваны балетмайстрам Ноакам. У 1781 пад яго кіраўніцтвам укамплектавана школа (у 1785 — 18 вучняў, пасля 1790 больш). Спачатку сярод вучняў пераважалі дзеці прыдворных музыкантаў, пазней — прыгонных сялян. Вучні атрымлівалі і некат. агульную адукацыю. Росквіт школы і падрыхтаванай ёю трупы звязаны з дзейнасцю балетмайстра і кампазітара Ф.Марыні (каля 1781—88) і польскага характарнага танцоўшчыка, саліста, балетмайстра і педагога слонімскага балета Ф.Шлянцоўскага (прыехаў паміж 1785—88, працаваў да 1792). У 1788 4 выхаванцы выступалі ў Варшаве ў балеце «Рыбакі», у сезон 1790—91 група (прыблізна 20 чал.) паказала 4 спектаклі на гастролях у г. Дубна (цяпер Украіна). Слонімскі балет паспяхова канкураваў з каралеўскім балетам у Варшаве. З 1792 школа і балетная трупа пераведзены ў мяст. Целяханы (цяпер Івацэвіцкі р-н Брэсцкай вобл.), дакладная дата іх роспуску невядома. *А.А.Саламаха.*

СЛО́НІМСКАЯ ГУБЕ́РНЯ, адм.-тэр. адзінка ў Рас. імперыі ў 1795—97. Цэнтр — г. *Слонім*. Утварэнне губерні абвешчана 25.12.1795 пасля 3-га падзелу Рэчы Паспалітай (1795) з зямель Навагрудскага, Гродзенскага, Віленскага і Брэсцкага ваяв. ВКЛ, якія напачатку ўвайшлі ў Гродзенскую (Ваўкавыскі, Брэсцкі, Гродзенскі, Навагрудскі, Пінскі, Слонімскі пав.) і Віленскую (Лідскі пав.) «часткі» (акругі), але рашэнне не рэалізавана. 2-і раз губерня створана ўказам ад 8.8.1796. Падзялялася на 8 паветаў: Брэсцкі, Ваўкавыскі, Гродзенскі, Кобрынскі, Лідскі, Навагрудскі, Пружанскі, Слонімскі. Афіцыйна пачала дзейнічаць з 8.9.1796 у якасці намесніцтва. Адміністрацыя і суд працавалі паводле «Устанаўлення для кіравання губерняў» 1775 пад апеляцыяй Сената. Указам Кацярыны II 12.12.1796 (сенацкім ад 6.2.1797) зліта з *Віленскай губерняй* у адзіную *Літоўскую губерню*.

Я.К.Анішчанка.

СЛО́НІМСКАЯ ДРУКА́РНЯ. Існавала ў 1777?—1782? у г. Слонім Гродзенскай вобл. Належала мецэнату М.К.Агінскаму, размяшчалася ў яго палацы. Першае выданне «Рэлігійны культ Брунона, патрона картузаў» (1777, на лац. мове) выйшла з удзелам дамініканцаў. На польскай і італьян. мовах выдадзена «Кніжка для дзяцей, або Уяўленне аб прадметах, якія дзеці павінны вывучаць» (1778), на польскай — напісаныя, як мяркуюць, Агінскім лібрэта опер «Сілы свету», «Становішча саслоўяў», «Елісейскія палі» (каля 1781).

Літ.: Мальдзіс А.І. Книгадрукаванне Беларусі ў XVIII ст. // Книга, библиотечное дело и библиография в Белоруссии. Мн., 1974.

Г.Я.Галенчанка.

СЛО́НІМСКАЯ ЕЗУІ́ЦКАЯ РЭЗІДЭ́НЦЫЯ, установа ордэна езуітаў у г. *Слонім* Гродзенскай вобл. Спробы ўтварэння місіі пачаліся ў 1664—65. У пач. 18 ст. зямельныя наданні слонімскім езуітам рабілі жмудскі кашталян А.Уніхоўскі, муж і жонка Талаканскія, М.Кошчыц, пробашч Віленскай кафедры ксёндз П.Палубінскі. У 1709—25 вядома як місія Навагрудскага езуіцкага калегіума, у 1725—73 — рэзідэнцыя. Драўляны касцёл св. Іосіфа ўзведзены ў Слоніме ў 1713—15, другі мураваны будаваўся з 1740 (не быў завершаны). Пры місіі дзейнічалі школы: граматыкі (з 1713), паэтыкі і рыторыкі (з 1714). У 1736 пры рэзідэнцыі створана школа філасофіі, з 1750 вывучаліся гісторыя і матэматыка. Меліся муз. бурса, канвікт (інтэрнат) для дзяцей збяднелай шляхты, б-ка. У розны час місіі і рэзідэнцыі належалі маёнткі Вішава, Грынкі, Дабосня, Шулякі, дзейнічалі місіі ў Ваўкавыску і Дабосні. Пасля скасавання рэзідэнцыі школа пераўтворана ў пав. вучылішча. Будынкі не захаваліся.

Ю.В.Бажэнаў.

СЛО́НІМСКАЯ КАМВО́ЛЬНА-ПРАДЗІ́ЛЬНАЯ ФА́БРЫКА. Будаўніцтва пачата ў 1971 у г. Слонім Гродзенскай вобл. 1-я чарга здадзена ў эксплуатацыю ў 1977, 2-я — у 1978. Асн. тэхнал. абсталяванне, у т.л. лабараторнае і для ачысткі фарбавальных сцёкаў, закуплена ў Італіі. З 1995 адкрытае акц. т-ва. Асн. прадукцыя (2001): паўшарсцяная трыкатажная пража высокіх і сярэдніх нумароў.

СЛО́НІМСКАЯ КАПЛІ́ЦА ДАМІНІ́КА, помнік архітэктуры ракако ў г. Слонім Гродзенскай вобл. Пабудавана ў 1745 з цэглы. Цэнтрычнае вежападобнае 3-яруснае збудаванне. 2 ніжнія ярусы маюць квадратнае сячэнне з увагнутымі гранямі і зрэзанымі вугламі, выразна падкрэслены чарапічнымі схіламі і прафіляванымі карнізамі. 1-ы ярус масіўны, маналітны, установлены на нізкім цокалі; 2-і скразны, з 4 арачнымі праметамі (прызначаліся для скульптуры св. Дамініка; не захавалася), 3-і — фігурная ўвагнута-пукатая вежачка з шатровым пакрыццём.

А.М.Кулагін.



Слонімская капліца Дамініка.



Аўтар Я.К.Анішчанка

СЛО́НІМСКАЯ КАПЭ́ЛА АГІ́НСКАГА, прыдворны аркестр гетмана вял. літ. Міхала Казіміра *Агінскага*. Існавала ў 1765?—93. Абслугоўвала паказы *Слонімскага тэатра Агінскага*, балі, касцельныя службы, рабіла канцэртныя паездкі. Вызначалася высокім прафес. узроўнем аркестра, своеасаблівым выканальніцкім стылем. Напачатку капэла складалася з 12 чал., з 1776 мела вял. ансамбль інструменталістаў і вакалістаў (53 чал.) на чале з Ю.Паўлі, А.Данезі і Я.Стэфані. Сярод музыкантаў: 24 прыгонныя (напр., Райскі, адзін з таленавітых удзельнікаў капэлы, прыгонны Радзівілаў, працаваў у Слоніме ў 1775—80) і замежныя (ням., чэшскія і італьян. спевакі, інструменталісты і дырыжоры (сярод якіх К.Чыпрыяні). Росквіт дзейнасці капэлы прыпадае на 1780. З 1-й пал. 1780 г. пачынаецца яе заняпад: паменшаў склад — многія замежныя музыканты перайшлі ў *Нясвіжскую капэлу Радзівілаў*. Часовы ўздым капэла і т-р перажылі ў канцы 1780 — пач. 1790-х г., аднак у 1792 у аркестры засталося ўсяго 12 музыкантаў і ён ужо не складаў маст. цэлага. *А.А.Саламаха.*

СЛО́НІМСКАЯ МЕДЗЭАПРАЦО́ЎЧАЯ ФА́БРЫКА. Дзейнічала ў 1843—55 у г. Слонім (Гродзенская вобл.). У 1850 мела паравую машыну, працавала 80 чал., вырабляла медны посуд, дэфекацыйныя і выпарныя катлы для цукр. з-даў. Са спыненнем буд-ва на Беларусі цукр. з-даў у 1855 ф-ка пераведзена ў Варшаву.

СЛО́НІМСКАЯ МУЗЫ́ЧНАЯ ШКО́ЛА. Існавала ў 1770—80-х г. пры *Слонімскім тэатры Агінскага*. У школе навучаліся хлопчыкі і дзяўчынкі, у т.л. прыгонныя, з мэтай падрыхтоўкі спевакоў і музыкантаў для т-ра і *Слонімскай капэлы Агінскага*.

СЛО́НІМСКАЯ РАЁННАЯ АНТЫФАШЫ́СЦКАЯ АРГАНІЗА́ЦЫЯ ў Вялікую Айчынную вайну. Дзейнічала ў ліст. 1942 — ліп. 1944 у г. Слонім і Слонімскім р-не Баранавіцкай (цяпер Гродзенскай) вобл. пад кіраўніцтвам Брэсцкага міжраённага «К-та барацьбы з ням. акупантамі» (да чэрв. 1943), Слонімскага падп. райкома КП(б)Б (з вер. 1943). Створана па ініцыятыве б.чл. КПЗБ і КСМЗБ. Складалася з 8 (100 чал.) ячэек (груп) у Слоніме (сакратары І.Д.Міско, В.І.Вільчынскі), вёсках Вял. Кракотка (К.С.Петручэня, Р.П.Збраевіч), Глоўсевічы (М.Р.Ракуць), Какошчыцы (Л.Я.Дабрыян, В.П.Дабрыян), Пасінічы (М.М.Анішчык, У.П.Філітовіч, Т.В.Кіслы, І.М.Цвікевіч), Сяргеевічы (В.А.Жукоўскі), Чамяры (М.В.Бурсевіч, З.Ц.Бурсевіч), Чапялёва (С.С.Гайко). Дзейнасць арг-цыі ўзначальваў к-т (сакратар Ф.З.Міско). Падпольшчыкі вялі агітацыю сярод насельніцтва, распаўсюджвалі зводкі Саўінфармбюро, выданні Слонімскага падп. райкома КП(б)Б, зрывалі спробы акупантаў па прымусовай мабілізацыі насельніцтва ва ўзбр. фаш. фарміраванні, вывазе моладзі ў Германію, збіралі грошы і каштоўнасці ў фонд абароны, зброю, боепрыпасы, медыкаменты, адзенне для партызан, праводзілі дыверсіі, удзельнічалі ў баявых аперацыях партызан на чыгунцы. У барацьбе з ворагам загінула 13 падпольшчыкаў.

Літ.: Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941—1945: Энцыкл. Мн., 1990. *Л.В.Аржаева.*



Слонімская сінагога.

СЛО́НІМСКАЯ СІНАГО́ГА, помнік архітэктуры барока ў г. Слонім Гродзенскай вобл. Пабудавана ў 1642 у гіст. цэнтры горада. Кампактны мураваны будынак мае выгляд базілікі. Да асн. квадратнага ў плане аб'ёму, накрытага 2-схільным дахам, з 3 бакоў прылягаюць больш нізкія аб'ёмы з дапаможнымі памяшканнямі. Гал. фасад завершаны франтонам складанага пластычнага абрысу і ўпрыгожаны дэкар. дэталямі: здвоеныя пілястры, нішы, люнеты, валюты па баках. Прыбудовы пры ўваходзе больш познія. Гал. зала ўнутры мае 9-польную сістэму скляпенняў. У цэнтры — біма, 4 слупы падтрымліваюць ліхтарню, аздобленую лепкай у тэхніцы стука. *Т.В.Габрусь.*

СЛО́НІМСКАЯ СЯДЗІ́БА «АЛЬБЯРЦІ́Н», помнік сядзібна-паркавай архітэктуры позняга класіцызму ў г. Слонім Гродзенскай вобл. Створана ў 1-й пал. 19 ст. ў б. прамысл. прыгарадзе Альбярцін (цяпер у межах горада) на заказ прамыслоўца В.Пуслоўскага. У комплекс уваходзілі: сядзібны дом, флігель, касп. пабудовы (стайня, млын і інш.), пейзажны парк і лесапарк з воз. Альбярцінскім, створаным запрудай і млыном на р. Іса. Побач з сядзібай размяшчаліся суконная і папяровая ф-кі ўладальніка. Сядзібны дом (пабудаваны на месцы старой карчмы) — 2-павярховы мураваны прамавугольны ў плане будынак з асім. аб'ёмна-прасторавай кампазіцыяй. На гал. фасадзе ў цэнтры 2-калонны іанічны порцік з антамі, завершаны трохвугольным франтонам, і бакавы рызаліт. У афармленні ўвахода выкарыстаны фігурныя скульптуры львоў. З касп. пабудоў захавалася стайня (пач. 20 ст., мадэрн) — неатынкаваны мураваны будынак з арнаментальнай муроўкай. У цэнтры гал. фасада арачны партал у выглядзе падковы, ляпная маска каня. *А.М.Кулагін.*



Бандарныя вырабы **Слонімскай фабрыкі мастацкіх вырабаў**. 1980-я г.

СЛО́НІМСКАЯ ФА́БРЫКА МАСТА́ЦКІХ ВЫ́РАБАЎ. Засн. ў 1960 у г. Слонім Гродзенскай вобл. на базе арцелі «Чырвоная зара» (з 1939). У 1981—88 да яе была далучана Баранавіцкая ф-ка маст. вырабаў (арганізавана ў 1960 на



Слонімская сядзіба «Альбярцін». Сядзібны дом. З малюнка 19 ст.

базе арцелі «Усход», засн. ў 1946). Спецыялізуецца на выпуску дзіцячага адзення, аздобленага ручной і машыннай вышыўкай, карункамі. Значнае месца ў вытворчасці займаюць ткацкія маст. вырабы (посцілкі, накідкі на крэслы, паласы, дываны), адметныя шматкаляровасцю і яркасцю. Выпускае таксама вырабы з дрэва (такарныя з размалёўкамі, бандарныя), металу (пано, біжутэрыя), лазы (фруктоўніцы, падносы, цукерніцы). *З.Я.Русанава.*

СЛО́НІМСКАЯ ФА́БРЫКА ХУ́СТАК. Дзейнічала ў 1890—1914 (з 1913 — ф-ка коўдраў) у г. Слонім (Гродзенская вобл.). Да 1900 вырабляла шарсцяныя хусткі ручнога вязання. У 1913 мела паравы рухавік, працавалі 94 чал. У 1914 выконвала заказы для арміі.

СЛО́НІМСКІ, біялагічны заказнік рэсп. значэння ў Слонімскім р-не Гродзенскай вобл. Засн. ў 1978 для аховы прыродных запасаў лек. раслін. Пл. 14,1 тыс. га. Лясны масіў, дзе пераважаюць хвойнікі імшыстыя, верасовыя, чарнічныя, арляковыя і інш., бярэзнікі, ельнікі, трапляюцца чорнаалешнікі, асіннікі, дубровы. Асн. лек. расліны: ядловец, ландыш майскі, талакнянка, крапіва двухдомная. У Чырв. кнігу Беларусі занесены: кадзіла сармацкае, купальнік горны, каменяломнік зярністы, чына горная, лілея кучаравая, канюшына лубінавая, артотрыхум Лаеля; з жывёл — барсук. *П.І.Лабанок.*

СЛО́НІМСКІ АНДРЭЕЎСКІ КАСЦЁЛ, помнік архітэктуры позняга барока ў г. Слонім Гродзенскай вобл. Пабудаваны ў 1775 з цэглы, рэстаўрыраваны пасля 1-й сусв. вайны. Пасля Вял. Айч. вайны не дзейнічаў. Перададзены вернікам у 1990-я г., рэстаўрыраваны (арх. В.Атас; фрэскавы жывапіс, М.Залатуха і У.Ракіцкі).

Першы драўляны касцёл засн. каля 1490 па фундацыі караля Казіміра IV Ягелончыка (першая культавая фундацыя горада). Новы будынак узведзены ў 1595 Л.Сапегам, у 1660 перабудаваны.

Мураваны храм 1-нефавы з 2-вежавым гал. фасадам. Неф, алтарная ч. і сім. бакавыя сакрысціі прамавугольныя ў плане, маюць сціплае дэкар. аздабленне. Вежы пастаўлены пад вуглом да гал. фасада, што надае яму хвалістую прасторавую структуру. Гал. фасад багата дэкарыраваны слаістымі пілястрамі, фігурным франтонам, валютамі, раскрапоўкамі, глыбокімі нішамі і інш. У інтэр'еры ілюзорна-перспектыўная фрэскавая размалёўка ў тэхніцы грызайль:



Слонімскі Андрэеўскі касцёл.

пілястры з ракайлямі, фігуры анёлаў, муз. атрыбуты, ваза. Пластычна-дэкар. акцэнт — гал. стукавы алтар у выглядзе порціка са здвоенымі карынфскімі калонамі, завершаны трохвугольным франтонам з буйнамаштабнымі скульптурамі анёлаў. У алтары скульптура «Укрыжаванне» і абраз «Маці Божая Жыровіцкая». На бакавых сценах прэсбітэрыя фрэскавыя кампазіцыі на біблейскія сюжэты. *Т.В.Габрусь, В.В.Церашчатава.*

СЛО́НІМСКІ БЕЛАРУ́СКІ ДРАМАТЫ́ЧНЫ ТЭА́ТР. Створаны 1.1.1990 у г. Слонім Гродзенскай вобл. на базе Слонімскага нар. тэатра. Заснавальнік і першы кіраўнік М.*Варвашэвіч*. У рэпертуары пераважаюць спектаклі камед. жанру, пастаўленыя ў традыцыях бел. нар. тэатра: «Прымакі» Я.Купалы, «Не абыцца і паспець на сябе хамут адзець» Л.Родзевіча, «Лекі ад кахання» і «Каханне з падманам» У.Галубка. Ставяцца п'есы сучасных бел. драматургаў: «Сабака з залатым зубам» У.Сауліча, «Жаніх па перапісцы» А.Федарэнкі, «Чужыя грошы» У.Бутрамеева, «Камедыя» У.Рудава паводле твораў К.Марашэўскага і Ф.Аляхновіча, «Чарнакніжнік» С.Кавалёва паводле твораў Я.Баршчэўскага. Значнае месца ў рэпертуары тэатра займаюць п'есы класічнай і сучаснай рус. і замежнай драматургіі: «Жаніцьба Бальзамінава» і «На бойкім месцы» А.Астроўскага, «Сямейны партрэт з чужым» С.Лабазёрава, «Пакуль яна памірала» Н.Птушкінай, «Мы ідзём глядзець «Чапаева» А.Данілава, «Гаспадыня гасцініцы» К.Гальдоні, «Непаразуменне» А.Камю, «Жарты Парыжа» К.Манье. Сярод пастановак для дзяцей: «Чарадзейныя суніцы», «Хітрыкі бабы Ягі», «Апошні дыназаўрык», «Добры змей», «Маўглі» А.Якімовіча, «Драўляны рыцар» Кавалёва, «Прынцэса і салдат» У.Ягоўдзіка, «Дзед Мароз і Лясун» Л.Рублеўскай, «Зайка-зазнайка» С.Міхалкова, «Папялушка» Т.Габэ, «Кот у ботах» С.Пракоф'ева і Г.Сапгіра. *С.М.Чыгрын.*

СЛО́НІМСКІ КАРДО́ННА-ПАПЯРО́ВЫ ЗАВО́Д. Засн. ў 1927 у г. Слонім Гродзенскай вобл. як кардонная ф-ка «Альбярцін». Выпускала шматслойны белы і каляровы кардон. У Вял. Айч. вайну разбурана. Аднавіла работу ў 1946. За перыяд 1954—1972 пушчаны 2-я—5-я кардонавырабныя машыны. З 1961 кардонная ф-ка «Беларусь», з 1972 папярова-кардонны камбінат, з 1976 — кар-



Слонімскі беларускі драматычны тэатр. Сцэна са спектакля «Непаразуменне» А.Камю.



Слонімскі беларускі драматычны тэатр. Сцэна са спектакля «Пакуль яна памірала» Н.Птушкінай.

донна-папяровы з-д, з 1988 — народнае прадпрыемства «Альбярцін», з 1995 адкрытае акц. т-ва «Слонімскі кардонна-папяровы завод «Альбярцін». Асн. прадукцыя (2001): кардон паліграф. і запалкавы, папера ўпаковачная, пачкавая, парафінаваная, мелаваная, мяшочная, туалетная, сурвэткі (белыя і каляровыя), шпагат папяровы, шпалеры, канцылярскія вырабы, тавары для школьнікаў і інш.



Слонімскі кардонна-папяровы завод. Цэх па вытворчасці папяровай масы.

СЛО́НІМСКІ КАСЦЁЛ І КЛЯ́ШТАР БЕРНАРДЗІ́НАК, помнік архітэктуры барока і ракако ў г. Слонім Гродзенскай вобл. Пабудаваны ў 2-й пал. 17 — 2-й пал. 18 ст. з цэглы на б. Рыначнай пл. Пашкоджаны пажарам у 1790, адноўлены ў 1793. Комплекс быў абнесены магутнай мураванай сцяной з барочнай уязной брамай (не захавалася).

Кляштар засн. К.Юдзіцкай-Салятыцкай, А.Юдзіцкім, пры ўдзеле братоў З. і К. Пражлаўскіх. З 1696 пры кляштары існавала брацтва св. Міхаіла. У 1830 сюды пераведзены бернардзінкі з Брэста. Пасля 1905 кляштар перададзены манашкам ордэна Бязгрэшнага Зачацця Дзевы Марыі (непакалянкам).

Касцёл пабудаваны ў 1664—70 ці 1670—96 на месцы драўлянага храма, які згарэў у 1656. 1-нефавы прамавугольны ў плане будынак з паўкруглай апсідай з рознавял. сакрысціямі і 3-яруснай чацверыковай вежай-званіцай пры ўваходзе. Верхні ярус вежы-званіцы дэкарыраваны здвоенымі лапаткамі, арачнымі нішамі, завершаны 4-схільным пакатым дахам. Сцены будынка расчлянёны масіўнымі слупамі-пілястрамі, капітэлі якіх дэкарыраваны стылізаваным расл. арнаментам. Інтэр'ер у 1751—64 упрыгожаны гал. 2-ярусным і 4 бакавымі алтарамі, амбонам, спавядальняй у стылі ракако (стукавыя арнаменты і скульптура выкананы майстрам І.Гедэлем паводле малюнкаў І.К.Глаўбіца); вылучалася барочная печ сакрысціі, абліцаваная зялёнай кафляй (17 ст., у 1970 знішчана). У 1764 да касцёла прыбудаваны 2-павярховы будынак жылога корпуса з замкнёным прамавугольным дваром (арх. І.Авадовіч). Фасады корпуса рытмічна расчлянёны піляст рамі, дэкарыраваны прафіляваным карнізам і поясам. Паўд.-зах. вугал будынка вылучаны рызалітам, умацаваным магутнымі контрфорсамі.

А.М.Кулагін, А.А.Ярашэвіч.



Слонімскі касцёл і кляштар бернардзінак. Выгляд касцёла з боку апсіды.

СЛО́НІМСКІ КАСЦЁЛ І КЛЯ́ШТАР БЕРНАРДЗІ́НЦАЎ, помнік архітэктуры барока ў г. Слонім Гродзенскай вобл. Засн. ў 1-й пал. 17 ст. па ініцыятыве Я.Жарскага і А. і С. Лукашэвічаў як апорны пункт сістэмы гар. абарончых збудаванняў. Касцёл пабудаваны ў 1639—45 (кіраўнік буд. работ майстар С.Тарашкевіч з Нясвіжа) па фундацыі каралеўскага сакратара А.Радвана. У 1655 згарэў, у 1671 адбудаваны. У 1861 у касцёле адбываліся патрыятычныя маніфестацыі, за што на яго быў накладзены штраф. У 1866 касцёл пераабсталяваны пад Троіцкую правасл. царкву (цяпер Троіцкі сабор). Уяўляе сабой 1-нефавы мураваны будынак з выцягнутым прэсбітэрыем, сакрысціямі і паўкруглай апсідай, 3-яруснай вежай-званіцай пры ўваходзе. Верхні ярус вежы-званіцы дэкарыраваны здвоенымі лапаткамі, арачнымі нішамі, завершаны 4-схільным пакатым дахам. Сцены будынка расчлянёны масіўнымі слупамі-пілястрамі, капітэлі якіх дэкарыраваны стылізаваным расл. арнаментам. Інтэр'ер у 1751—64 упрыгожаны гал. 2-ярусным і 4 бакавымі алтарамі, амбонам, спавядальняй у стылі ракако (стукавыя арнаменты і скульптура выкананы майстрам І.Гедэлем паводле малюнкаў І.К.Глаўбіца); вылучалася барочная печ сакрысціі, абліцаваная зялёнай кафляй (17 ст., у 1970 знішчана). У 1764 да касцёла прыбудаваны 2-павярховы будынак жылога корпуса з замкнёным прамавугольным дваром (арх. І.Авадовіч). Фасады корпуса рытмічна расчлянёны піляст рамі, дэкарыраваны прафіляваным карнізам і поясам. Паўд.-зах. вугал будынка вылучаны рызалітам, умацаваным магутнымі контрфорсамі.

А.М.Кулагін, А.А.Ярашэвіч.



Слонімскі касцёл і кляштар бернардзінак. Галоўны алтар касцёла.



Слонімскі касцёл і кляштар бернардзінцаў. Сучасны Троіцкі праваслаўны сабор.

цай (1-ы ярус квадратны ў плане, умацаваны контрфорсамі, 2 верхнія — 8-гранныя, аздобленыя пілястрамі), накрытай шатровым дахам. У 1668 і 1750 да апсіды прыбудаваны 2 бакавыя квадратныя ў плане капліцы Праслаўскіх і Слізняў, завершаныя шлемападобнымі купаламі. Сцены касцёла ўмацаваны контрфорсамі, вял. аконныя праёмы з паўцыркульнымі завяршэннямі. Уваходны партал касцёла аформлены ордэрнымі элементамі: паўкалонамі, спрошчаным антаблементам, архівольтамі. Гал. і бакавы алтары ў стылі ракако 1-й пал. 18 ст. Пасля 1864 у алтары ўстаноўлены іканастас. З паўд. боку ад касцёла размяшчаецца корпус кляштара (пабудаваны ў 1749) — 2-павярховы П-падобны ў плане мураваны будынак, глухія сцены якога прарэзаны прамавугольнымі аконнымі праёмамі, аздоблены пілястрамі і міжпавярхавай цягай.

А.М.Кулагін, А.А.Ярашэвіч.

СЛО́НІМСКІ КЛЯ́ШТАР КАНО́НІКАЎ ЛАТЭРА́НСКІХ, помнік архітэктуры 17 ст. ў г. Слонім. Засн. ў 1635 Я.С.Сапегай (старэйшы сын канцлера Л.І.Сапегі) з наданнем маёнтка Дарава. Верагодна, волю памерлага брата выканаў у 1650 падканцлер ВКЛ, староста слонімскі К.Л.Сапега. Кляштарны комплекс знаходзіўся на краі рыначнай плошчы, займаў квартал паміж вул. Студэнцкай і Панасаўскай, уключаў мураваныя касцёл Божага Цела, 2-павярховы жылы і 1-павярховы гасп. карпусы, сад, агарод. Касцёл пабудаваны ў рэнесансавым стылі, меў шчытавы фасад, гранёную апсіду, бакавыя капліцы. Кляштар скасаваны ў 1832, касцёл быў перароблены пад Спаса-Праабражэнскі правасл. сабор, разбураны ў 1950-я г., з 2000 аднаўляецца.

А.А.Ярашэвіч.

СЛО́НІМСКІ КРАЯЗНА́ЎЧЫ МУЗЕ́Й. Адкрыты ў 1929 у г. *Слонім* Гродзенскай вобл. па ініцыятыве краязнаўца І.І.Стаброўскага, які ў 1939 падараваў музею свае калекцыі. У Вял. Айч. вайну музей часткова разрабаваны. З 1945 наз. Баранавіцкі краязн. музей, з 1952 сучасная назва. Пл. экспазіцыі 400 м^2, 5 залаў, больш за 20,5 тыс. адзінак асн. фонду (2002). Сярод экспанатаў стараж. крамянёвыя прылады працы, каменны язычніцкі ідал 10 ст., ганчарны посуд, шкляныя і бронзавыя ўпрыгожанні, фрагменты тканіны, абутак 13 ст. з археал. помнікаў Слонімшчыны, скарбы манет 16—18 ст., фрагменты драўлянага водаправода 18 ст., калекцыя старадрукаў і рэдкіх кніг 16 — пач. 20 ст., пахавальны партрэт А.М.Пацея (гл. ў арт. *Пацеі*), сярэбраны футарал, у якім было пахавана яго сэрца, матэрыялы і дакументы пра падзеі часоў паўстанняў 1794, 1863—64, 1-й сусв. і Вял. Айч. войнаў, калекцыі прадметаў нар. побыту, адзення і твораў мастацтва 19 — пач. 20 ст., рэшткі жывёл ледавіковага перыяду, дыярамы змен раслінага і жывёльнага светаў. Музей наладжвае выстаўкі нар. ткацтва, вышыўкі, ганчарства, твораў мясц. мастакоў, прадметаў побыту і інш.

І.Р.Шпыркова.

СЛО́НІМСКІ ЛЕСАПІ́ЛЬНЫ ЗАВО́Д. Дзейнічаў у 1896—1946 у г. Слонім (Гродзенская вобл.). Вырабляў дошкі, брусы. У 1913 меў паравую машыну, працавала 50 чал.

СЛО́НІМСКІ ПАВЕ́Т, адм.-тэр. адзінка ў ВКЛ, Рас. імперыі і Польшчы. Папярэднікам С.п. было Слонімскае намес-



ніцтва, якое з 1413 уваходзіла ў *Троскае ваяводства*. У выніку адм. рэформы 1565—66 С.п. набыў акрэсленыя межы і ўключаны ў *Навагрудскае ваяводства*. У яго ўвайшлі Слонімскае, Моўчадскае і Здзітаўскае дзярж. староствы і вял. колькасць шляхецкіх маёнткаў, найб. з іх Дзярэчын, Здзяцел (Дзятлава), Ружаны. На тэр. павета знаходзіўся *Жыровіцкі Успенскі манастыр*. С.п. меў павятовую харугву чырв. колеру з выявай «Пагоні». У 1795 С.п. далучаны да Рас. імперыі і практычна ў тых жа межах уключаны ў *Слонімскую губерню*; з 12.12.1796 у *Літоўскай губерні*, з 28.8.1802 у *Гродзенскай губерні*. Пл. каля 6,3 тыс. кв. вёрст. У 1861—66 утвораны 23 воласці: Боркінская, Быценская, Гічыцкая, Дабромысленская, Дварэцкая, Дзераўноўская, Дзярэчынская, Дзятлаўская, Жыровіцкая, Казлоўская, Кастровіцкая, Косаўская, Курылавіцкая, Люшнеўская, Мар'янская, Міжэвіцкая, Пацаўская, Пескаўская, Раготнаўская, Ружанская, Старавеская, Чамерская, Шылавіцкая. Насельніцтва ў 1878 — 161,2 тыс. чал. (у т.л. ў Слоніме 15,4 тыс. чал.). Мелася 1035 нас. пунктаў, у т.л. 15 мястэчак (Бусяж, Быцень, Вензавец, Галынка, Дварэц, Дзераўная, Дзярэчын, Азярніца, Жыровічы, Здзітаў, Здзяцел (Дзятлава), Косава, Моўчадзь, Ружаны, Старыя Дзевяткавічы), 534 дробныя паселішчы (менш як па 25 чал.). Апрача Жыровіцкага манастыра, былі 73 царквы, 5 касцёлаў, 30 іудзейскіх малітоўных дамоў і сінагог. У 1897 у С.п. 226,3 тыс. чал., у т.л. ў Слоніме 15,9 тыс. чал. У 1915 тэр. С.п. занята нямецкімі, у пач. 1919 — польскімі войскамі. З 4.2.1921 С.п. у складзе Навагрудскага ваяв. Польшчы. У 1923 падзяляўся на 18 гмін: Быценскую, Дабромысленскую, Дварэцкую, Дзераўноўскую, Дзярэчынскую, Дзятлаўскую, Жыровіцкую, Казлоўшчынскую, Кастровіцкую, Курылавіцкую, Мар'янскую, Міжэвіцкую, Моўчадскую, Пацаўскую, Раготнаўскую, Старавескую, Чамерскую, Шылавіцкую. З 14.11.1939 у складзе БССР, 4.12.1939 увайшоў у Баранавіцкую вобл. 15.1.1940 павет скасаваны. Яго тэрыторыя падзелена паміж Быценскім, Дзятлаўскім, Казлоўшчынскім і Слонімскім р-намі. *В.Л.Насевіч.*



Аўтар В.Л.Насевіч

СЛО́НІМСКІ РАЁН. На Пд Гродзенскай вобл. Утвораны 15.1.1940. Пл. 1,5 тыс. км^2. Нас. 22,4 тыс. чал. (2001, без г. Слонім). Сярэдняя шчыльн. 15 чал. на 1 км^2. Цэнтр — г. *Слонім*. Уключае 147 сельскіх населеных пунктаў, 12 сельсаветаў: Азгінавіцкі, Азярніцкі, Васілевіцкі, Велікашылавіцкі, Дзераўнянскі, Дзераўноўскі, Жыровіцкі, Міжэвіцкі, Новадзевяткавіцкі, Паўлаўскі, Сянькоўшчынскі, Сялявіцкі.

Тэр. раёна ў межах *Слонімскага ўзвышша* на З, ускраін *Навагрудскага ўзвышша* на ПнУ, *Нёманскай нізіны* на Пн і *Баранавіцкай раўніны* на У і Пд. Паверхня ўзгорыста-платопадобная, 80% яе на выш. 160—200 м, найвыш. пункт 223 м (на ПнУ раёна). Агульны нахіл паверхні да далiны р. Шчара. Карысныя выкапні: мел, пясчана-жвіровы матэрыял, гліны і суглінкі для грубай керамікі, буд. пяскі, торф, сапрапель. Сярэдняя т-ра студз. -5,4 °С, ліп. 17,8 °С. Ападкаў 592 мм за год. Вегетац. перыяд 196 сутак. Найб. р. Шчара з прытокамі Грыўда, Бяроза, Іса, на мяжы з Зэльвенскім р-нам — Зальвянка. Пераважаюць глебы с.-г. угоддзяў: дзярнова-падзолістыя (62,6%), дзярнова падзолістыя забалочаныя (12,6%), дзярновыя і дзярнова-карбанатныя забалочаныя (10,1%). Пад лесам 38% тэр. раёна. Лясы пераважна хваёвыя, бярозавыя, яловыя, дубовыя, трапляюцца грабавыя, асінавыя, чорнаальховыя і інш. Найб. лясныя масівы на Пн у міжрэччы Шчары і Ісы і на У раёна. Штучныя насаджэнні (39% лясоў), пераважна з хвоі, радзей елкі, дубу, ліпы, бярозы. На тэр. раёна біял. заказнік рэсп. значэння *Слонімскі*; біял. заказнікі мясц. значэння Кракотка. Помнікі прыроды рэсп. значэння: валун Расколаты камень у Альбярцінскім лясніцтве, дуб чарэшчаты ў Сянькоўшчынскім лясніцтве, ліпа каралінская ў г. Слонім, гара Каўпак каля в. Парэчча, валуны Вял. камень каля в. Смаўжы, Вялікі і Кракоцкі камяні каля в. Вял. Кракотка; мясц. значэння: дзюна Прырэчанская каля в. Прырэчча, гара Пяроўка каля в. Васілевічы, гара Стражынае каля в. Дзераўная, Вял. камяні каля в. Сянькоўшчына і Рудаўка.



Агульная пл. с.-г. угоддзяў 75,1 тыс. га, з іх асушаных 14,8 тыс. га. На 1.1.2002 у раёне 13 калгасаў, 5 с.-г. прадпрыемстваў, 10 фермерскіх гаспадарак, птушкафабрыка. Сельская гаспадарка спецыялізуецца на мяса-малочнай жывёлагадоўлі, свінагадоўлі, птушкагадоўлі, ільнаводстве, вырошчванні збожжавых і кармавых культур, бульбы. Прадпрыемствы буд. матэрыялаў (драбільна-сартавальная вытворчасць пяску і друзу), металапрам. (рамонт с.-г. рухавікоў), першасная апрацоўкі лёну (перапрацоўка льнатрасты), камбікормавай прам-сці; лясгас. Па тэр. раёна праходзяць: чыг. Баранавічы—Ваўкавыск, аўтадарогі Слонім—Высокае, Баранавічы—Ваўкавыск, Быцень—Слонім—Ліда, Слонім—Масты—Скідзель. У раёне 13 сярэдніх, 9 базавых, 2 пач., 4 муз., 1 спарт. школы, аграрна-тэхн. каледж (гл. *Жыровіцкі сельскагаспадарчы тэхнікум*), с.-г. ліцэй, станцыя юных турыстаў, Цэнтр дзіцячай творчасці, 18 дашкольных установ, 38 сельскіх клубаў і дамоў культуры, 38 б-к, 6 бальніц, 2 дыспансеры, 4 паліклінікі, 7 амбулаторый, 25 фельч.-ак. пунктаў, дом-інтэрнат для састарэлых. Краязнаўчы музей. Помнікі архітэктуры: цэрквы — Міхайлаўская (19 ст.) у в. Вострава, Мікалаеўская (2-я пал. 19 ст.) у в. Вялікія Шылавічы, Троіцкая (2-я пал. 19 ст.) у в. Дзераўная, *Жыровіцкі Успенскі манастыр*, царква Раства Багародзіцы (19 ст.) у в. Міжэвічы, касцёл (2-я пал. 19 — пач. 20 ст.) у в. Сялявічы. Выдаецца газ. «Слонімскі веснік».

Р.Р.Паўлавец, А.М.Тарсуноў.

СЛО́НІМСКІ ТЭА́ТР АГІ́НСКАГА, прыдворная тэатральная трупа гетмана вял. літ. Міхала Казіміра *Агінскага* ў г. Слонім Гродзенскай вобл. Засн. да 1771, спыніў дзейнасць пасля 1791. У т-ры працавалі прафес. італьян., ням., польскія спевакі, прыгонны хор і балет. Балетная трупа падрыхтавана ў *Слонімскай балетнай школе*. Паказы суправаджала *Слонімская капэла Агінскага*. У 1770—80-я г. пры т-ры існавала муз. школа.

Рэпертуар т-ра складаўся з балетаў, у т.л. «Каралеўскі балет», «Дзікі балет» і «Дзэершір» (апошнія два паказаны ў 1790—91 на гастролях у г. Дубна, Украіна), опер італьян. кампазітараў Дж.Паізіела, Э.Дуні, А.Грэтры, П.А.Мансіні, Н.Іамелі, А.Сакіні, П.А.Гульельмі, К.В.Глюка, Дж.Таэскі («Тэлемах», 1780) і інш., а таксама Агінскага («Зменены філосаф», 1771; «Елісейскія палі», 1788); трагедый Вальтэра («Альзіра», 1780, 1783 і «Мар'яна», 1786) і інш. Паводле «Інвентара інструментаў і музычных папер» (складзены ў 1801, пракаменціраваны А.Цеханавецкім) збор нот твораў, што выконваліся на розных сцэнах т-ра Агінскага, уключае 60 опер, 18 балетаў, 3 муз. камедыі, 253 сімфоніі і больш за 460 інш. муз. твораў (араторыі, арыі, музыка для дывертысментаў, асобных танцаў і інш.). Сярод выканаўцаў дачка «мэт-

ра ігры на клавікордзе» Д.Грабенбаўэра, Г.Давіа, П.Драздоўская, Лісевічаўна, Канапкоўна, Кінтнер, Герман, Пленц, Марцінкевічаўна, Шуцкая, Міхайлоўская, Цэльнер; салісты Янскі і М.Лазарыні. Філіялы т-ра працавалі ў Седльцах (Польшча) і Целяханах (Івацэвіцкі р-н Брэсцкай вобл.). У 1771 функцыянаваў «плывучы тэатр» на баржах на Агінскім канале; паміж 1777—80 пабудаваны «Дом оперы» (арх. І.Мараіна, разбураны пасля 1804), які меў вял. сцэну, прыстасаваную для паказаў любых барочных спектакляў, оперных і балетных, для выхаду вял. колькасці спевакоў і статыстаў, для тэатр. баталій коннікаў і водных феерый (частка сцэны затаплялася вадой з канала і па ёй плавалі лодкі), для складаных перспектыў і дэкарацый, розных сцэнічных эфектаў. Тэхн. магчымасці сцэны дазвалялі паказаць і 2 фантаны, якія асвятляліся бенгальскімі агнямі (пры т-ры быў спец. піратэхнік — «майстар па феерверках» Ц.Г.Вакмунт). Дэкарацыі для т-ра стваралі Марана і тэатр. машыніст Жан Баі (у дакументах праходзіў пад імем Ян Бой). Сярод інш. мастакоў т-ра: К.Атасельскі, Штроўбл (працаваў да 1777), І.Рэгер (1776—78), Ян Рустэм (1788—90), А.С.Дамброўскі і прыгонныя майстры-дэкаратары Міхал, Мікалай, Янак.

Літ.: Барышаў Г.І. Слонімскі тэатр М.Агінскага // Гісторыя беларускага тэатра. Мн., 1983. Т. 1; Яго ж. Слонімскі унікум // Тэатр. Мінск. 1984. № 6; Цеханавецкі А. Міхал Казімір Агінскі і яго «сядзіба музаў» у Слоніме: Пер. з ням. Мн., 1993.

СЛО́НІМСКІ ШКО́ЛЬНЫ ТЭ́АТР. Існаваў у 1744—69 у г. Слонім Гродзенскай вобл. пры езуіцкім калегіуме. У рэпертуары пераважалі драмы на рэліг., міфалагічныя і гіст. сюжэты. Захаваліся звесткі пра пастаўленыя ў ім 4 п'есы. Паказы адбываліся пераважна на лац., зрэдку на польскай мовах, звычайна яны суправаджаліся алегарычнымі пралогам, эпілогам, харамі, інтэрмедыямі. Паказы найчасцей былі прымеркаваны да пастоў, завяршэння навуч. года, некат. свят. Аўтарамі пастановак былі выкладчыкі калегіума, у спектаклях удзельнічалі і выкладчыкі, і навучэнцы. Пастаноўкі: масленічная драма «Імгненне няшчаснай вечнасці» Ф.Навадворскага, дыдактычная драма «Кветка з надпісам імёнаў цароў» (абедзве 1744), «Задумы з галавы Палады» (1749), драма «Аляксей» (1769), прымеркаваная да імянін мецэната т-ра гетмана М.К.Агінскага, якая потым была выдадзена асобнай кніжкай на польскай мове.

Літ.: Гісторыя беларускага тэатра. Мн., 1983. Т. 1. С. 142; Барышев Г.И. Театральная культура Белоруссии XVIII в. Мн., 1992. *І.А.Алексніна.*

СЛО́НІМСКІЯ ВЫСТУПЛЕ́ННІ СЯЛЯ́Н. У абставінах гасп. разрухі ў 2-й пал. 17 ст., выкліканай вайной Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—67 і недахопам грошай у казне, сялянам Слонімскага староства выдавалі каралеўскія граматы, якія часткова замянялі паншчыну грашовым чыншам, а вёскі Какошчычы, Кракотка, Лапухова, Мяльканавічы, Перавалока, Саленікі, Сасноўка, Сялявічы, Чамяры, Якуцічы дамагліся права «сядзець» на «голым» чыншы. Калі трымальніца староства Г.Сапега (жонка вял. гетмана ВКЛ П.Сапегі) запатрабавала ад сялян выканання паншчыны і інш. павіннасцей адпаведна даўнейшым інвентарам, яны не пагадзіліся. Асабліва актыўна выступалі сяляне, якія былі на «голым» чыншы. У кастр. 1701 Г.Сапега скардзілася ў слонімскі гродскі суд, што сяляне бунтуюць і адмаўляюцца выконваць паншчыну і інш. павіннасці. У 1720 хваляванні ахапілі Загжывальскае, Любішэцкае, Мяльканавіцкае і Чамерскае войтаўствы. У 2-й пал. 18 ст. тут адбыліся выступленні служылых людзей шэрагу баярскіх і канюшых вёсак. Да сярэдзіны 18 ст. яны «сядзелі» на грашовым чыншы. Спроба павялічыць павіннасці ў пач. 1750-х г. выклікала супраціўленне сялян-слуг. Сяляне не падпарадкоўваліся трымальніку Слонімскага староства на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў.

Літ.: Гісторыя сялянства Беларусі. Т. 1. Гісторыя сялянства Беларусі са старажытнасці да 1861 г. Мн., 1997; Мелешко В.И. Классовая борьба в белорусской деревне во второй половине XVII—XVIII в. Мн., 1982. *В.І.Мялешка.*

СЛО́НІМСКІЯ ГІМНА́ЗІІ. Існавалі ў 1906—18. Падпарадкоўваліся Віленскай навуч. акрузе. Жаночая гімназія засн. 24.9.1910. Мела падрыхтоўчы і 7 асн. класаў. У 6-м і 7-м класах былі паралельныя аддзяленні. Утрымлівалася за кошт платы за навучанне (80 руб. штогод з вучаніцы) і фін. дапамогі з казны. У 1911 вучылася 338 дзяўчат, у 1915 — 260. Гімназіяй кіраваў дырэктар, працавалі гал. наглядчыца і 9 класных наглядчыц, 4 законанастаўнікі, 11 выкладчыкаў, урач і дантыст. Сярод выкладчыкаў выхаванцы ун-таў Масквы, Пецярбурга, Кіева, Міргарадскай прамысл.-маст. школы, Беластоцкага Мікалаеўскага ін-та, гімназій Гродна, Гомеля і інш. Выкладаліся: Закон Божы, рус., ням. і франц. мовы, гісторыя, прыродазнаўства, матэматыка, фізіка, маляванне, гігіена, геаграфія, рукадзелле, спевы і танцы. У час 1-й сусв. вайны (восень 1915) пераведзена ў г. Калуга. Спыніла дзейнасць у 1918. Жаночая прыватная яўрэйская прагімназія Х.Я.Орман-Юдкоўскай пераўтворана 3.11.1906 з прыватнага вучылішча (дзейнічала з 1898). Мела падрыхтоўчы і 4 асн. класы. Утрымлівалася за кошт платы за навучанне (30—50 руб. штогод з вучаніцы) і дапамогі ў 200 руб. з сум мясц. карабейнага яўр. збору. У 1911 вучыліся 130 дзяўчат, у 1915 — 121. Працавала 13 чал., сярод іх выхаванцы Кіеўскага політэхн. ін-та, Віленскага яўр. настаўніцкага ін-та, гімназій Гродна, Дзвінска, Магілёва, Ваўкавыска і Віцебска. Выкладаліся: закон яўр. веры, гісторыя, рус., ням. і франц. мовы, прыродазнаўства, геаграфія, рукадзелле, арыфметыка, чыстапісанне. Спыніла дзейнасць у 1915.

Літ.: Асвета і педагагічная думка ў Беларусі: Са старажытных часоў да 1917 г. Мн., 1985; Нарысы гісторыі народнай асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі. Мн., 1968. *А.Ф.Самусік.*

СЛО́НІМСКІЯ ЗА́МКІ. Існавалі ў 13—18 ст. у г. *Слонім*. Размяшчаліся на левым беразе р. Шчара. Умацаваным цэнтрам сярэдневяковага Слоніма быў Верхні замак, які займаў узвышша памерам 150×200 м. Замкавая пляцоўка мела форму няправільнага прамавугольніка, узвышалася над ракой на 3—4 м, была ахавана ровам шырынёй 15—18 м і глыбінёй каля 8 м. У 14—18 ст. побач з Верхнім размяшчаўся Ніжні замак, які займаў падковападобную пляцоўку, ахоўваўся земляным валам і вадзяным ровам. Нягледзячы на наданне ў 1531 Слоніму магдэбургскага права, ён у адрозненне ад інш. падобных гарадоў ніколі не меў уласна гар. умацаванняў. З ПдЗ горад абкружалі высокія ўзвышшы, што панавалі над усім навакольлем, і ўзвядзенне каля іх падножжа абарончых збудаванняў не мела сэнсу. Аднак на сутыку гандл. шляхоў была размешчана сістэма ўмацавання з цэрквоў і кляштараў, якая запірала ўезды-выезды з горада. У вайну Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—67 яны ўсё ж не змаглі абараніць у 1655 абязлюдзелы Слонім. Пазней умацаванні С.з. былі адноўлены і праіснавалі да канца 18 ст. *М.А.Ткачоў.*

СЛО́НІМСКІЯ МАНУФАКТУ́РЫ. У 2-й пал. 18 ст. ў г. *Слонім* вял. гетман ВКЛ Міхал Казімір Агінскі (гл. ў арт. *Агінскія*) засн. мануфактуры, якія выраблялі шаўковыя тканіны, «персідскія дываны», кілімы і інш. тканыя рэчы. Росквіт вытв-сці дываноў прыпадаў на 1788—92. У 1820—1914 дзейнічалі 2 суконныя, саламяных каўпакоў (1895—1914) і гарбарная (1905) мануфактуры. Суконная мануфактура (засн. ў 1820) у 1828 мела 28 ткацкіх, 8 фарбавальных станкоў, 15 прадзільных, 9 часальных, 7 ворсавых, 20 стрыгальных машын, валюшню, прэс; працавалі 162 рабочыя, 12 майстроў. На 1-й Усерас. прамысл. выстаўцы (Пецярбург, 1829) мануфактура адзначана малым залатым медалём. У 1833 атрымала права мець на сваіх вырабах дзярж. герб. На 4-й Усерас. прамысл. выстаўцы (Масква, 1835) адзначана вял. залатым медалём. Другая суконная мануфактура ў 1823 мела 13 ткацкіх станкоў, працавала 111 вольнанаёмных рабочых. На мануфактуры саламяных каўпакоў (для ўпакоўкі бутэлек) у 1900 працавала 65 чал. На гарбарнай мануфактуры працавала 90 чал.

СЛО́НКА, вальдшнэп (Scolopax rusticola), птушка сям. бакасавых атр. сеўцападобных. Пашырана ў Еўразіі. Жыве ў вільготных мясцінах мяшаных і лісцевых лясоў, паблізу балот. На Беларусі звычайны пралётны і пралётны від. Нар. назва сломка. Зімуе на Пд Еўразіі і ў Паўн. Афрыцы.

Даўж. цела да 38 см, крыла да 20 см, маса да 350 г. Апярэнне спіны рыжавата-бурае з цёмнымі і светлымі стракацінамі, брушка рыжавата-шэрае з папярочным бурым малюнкам. Дзюба доўгая, моцная. Ногі адносна ка-

роткія, шаравата-ружовыя. Кормяцца чарвямі, смаўжамі, насякомымі і іх лічынкамі. Палігамы. Аб'ект палявання.

СЛО́НСКІ Яўстафій Рыгоравіч (5.5.1886, в. Юр'ева Смалявіцкага р-на Мінскай вобл. — 28.9.1943), Герой Сав. Саюза (1944). У Чырв. Арміі з 1918. Удзельнік грамадз. вайны 1918—20, баёў на Паўд. фронце. У Вял. Айч. вайну



Я.Р.Слонскі.

з 1941 на Варонежскім фронце. Нам. камандзіра палка маёр С. вызначыўся ў 1943 у бітве за Дняпро ў Кіеўскай вобл., дзе ў ліку першых падраздзяленняў фарсіраваў раку і авалодаў в. Юшкі, чым забяспечыў пераправу палка; загінуў пры адбіцці контратакі ворага.



Слонка.

СЛО́ЎНІК, даведачнае выданне, у якім даецца апісанне групы слоў (марфем, словазлучэнняў і інш.), размешчаных у пэўным парадку. С. часам называюць лексіку якой-н. мовы або яе асобныя лексічныя пласты (гл. *Лексікаграфія*). Асн. грамадскія функцыі С.: інфармацыйная (*лінгвістычныя слоўнікі* і *энцыклапедычныя слоўнікі*), камунікацыйная (перакладныя С., або *двухмоўныя слоўнікі*), нарматыўная (лексікаграфічныя працы кадыфікацыйнага характару пры дапамозе стыліст. памет стабілізуюць лексічныя і інш. нормы мовы).

С. вядомы з глыбокай старажытнасці. У б-цы асірыйскага цара Ашурбаніпала ў Ніневіі выяўлены гліняныя клінапісныя таблічкі, на якіх занатаваны тэматычна згрупаваныя словы шумерскай і акадскай моў 7 ст. да н.э. Першыя С. ў Еўропе створаны ў Стараж. Грэцыі ў 1 ст. да н.э. (збор грэч. слоў, выкарыстаных Гамерам, складзены філосафам Апалоніем). Першы С. лац. мовы — «De Verborum Significate» («Значэнне слоў») В.Флакуса (1 ст. н.э.). Пасля 5 ст. н.э. з'явіліся першыя спец. С. па батаніцы, медыцыне, астраноміі на санскрыце, а таксама шматмоўныя С. (уключалі словы санскрыцкай, тыбецкай, манг. і кіт. моў). Першымі друкаванымі С. былі англ. «Свет слоў» (1598) Дж.Флорыя, у якім італьян. словы перакладзены на англ. мову, і «Алфавітны спіс» (1604) Р.Коўдры, дзе лац. і інш. запазычаныя тэрміны тлумачацца па-англійску. У 17—18 ст. у многіх краінах Еўропы выдадзены першыя акад. С. нац. моў, якія нармалізавалі (кадыфікавалі) слоўнікавы склад літ. мовы: італьян. «Слоўнік Акадэміі Круска» (1612), франц. (1694), ісп. «Слоўнік Аўтарытэтаў» (1739), рус. «Словавытворны слоўнік» (т. 1—6, 1789—94).

Першыя ўсх.-слав. С. бяруць пачатак ад ананімных рукапісных даведнікаў, што дадаваліся да сербскіх рэліг. твораў, якія з'явіліся ў Стараж. Русі з прыняццем хрысціянства. У такіх даведніках звычайна тлумачыліся незразумелыя словы грэч. і стараж.-яўр. моў («Речь жидовского языка преложена на русскую, неразумно на разум и в Евангелиях и Апостолах, и в Псалтыри и Паремии и в прочих книгах» у Ноўгарадскай кормчай 1282; Ноўгарадскі слоўнік 1431, які дадаваўся да твора Іаана Лесвічніка «Тлькование неудобь познаваемом в писанных речем, понеже положены суть речи в книгах от начальных преводних ово Словенскы и ино Сръбскы и другая Блъгарскы и Гръчьскы их же неудоволишася преложити на Рускыи»). Усх.-слав. *азбукоўнікі* паслужылі крыніцамі пры стварэнні першых друкаваных С. усх. славян. Л.Зізаній надрукаваў як дадатак да царк.-слав. буквара перакладны слоўнік «Лексис, сиречь речения вкратце собраны и из словенского языка на просты русский диялект истолкованы» (Вільня, 1596), у якім перакладзена і растлумачана 1061 слова з царкоўнаслав. і інш. моў. «Лексикон славенороссків и именъ тлькование» П.Бярынды (Кіеў, 1627; 2-е выд., 1653, Куцейна каля Оршы) змяшчае 6982 лексічныя адзінкі, у т.л. больш за 4 тыс. царкоўнаславянізмаў, каля 2 тыс. іншамоўных запазычанняў і некалькі соцень мясц. (старабел. і старажытнарус.) слоў. Да ранняга перыяду развіцця С. на Беларусі адносяцца рукапісныя і друкаваныя азбукоўнікі, лексісы, лексіконы, а таксама створаныя на працягу 17—19 ст. С. бел. дыялектныя К.Ф.Калайдовіча, Ф.С.Шымкевіча, Я.Чачота, С.П.Мікуцкага, П.М.Шпілеўскага, Е.Р.Раманава, П.В.Шэйна і інш., гіст. С. старабел. мовы І.І.Грыгаровіча, І.П.Навіцкага, М.І.Гарбачэўскага, І.І.Насовіча і інш. Асн. іх функцыя — апісанне лексічных багацця нац. мовы. Складзены Насовічам «Слоўнік беларускай мовы» (1870) меў многія ўласцівыя для тагачасных акад. С. лексікаграфічныя параметры (нарматыўны, стылістычны, дэфініцыйны, ілюстрацыйны, грамат. і інш.). З пач. 20 ст. на Беларусі пачаўся перыяд навук. лексікаграфіі. Выдаваліся тэрміналагічныя С., універсальныя, галіновыя і рэгіянальныя *энцыклапедыі*; распрацаваны лексікаграфія дыялектная, гіст., перакладная, энцыклапедычная, тэрмінаграфія і інш., у рамках якіх створана па некалькі дзесяткаў С. розных тыпаў. Існуюць і інш. лексікаграфічныя кірункі: лексікаграфія грамат., камп'ютэрная, лінгвакраіназнаўчая, тэалагічная, ідэаграфія, канцэптаграфія і г.д., што прадстаўлены адзінкавымі С. Ін-т мовазнаўства Нац. АН Беларусі падрыхтаваў акад. «Тлумачальны слоўнік беларускай мовы» (т. 1—5, 1977—84, больш за 105 тыс. слоўнікавых артыкулаў), 1-томны «Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы» (1996; 5-е выд. 2001, 65 тыс. слоў). Бібліяграфія бел. С. ўключае больш за 1 тыс. назваў. У залежнасці ад таго, якія адзінкі мовы ў С. апісваюцца, вылучаюцца С. марфем («Марфемны слоўнік беларускай мовы» А.М.Бардовіча, Л.М.Шакуна, 1975; «Словаўтваральны слоўнік беларускай мовы» Бардовіча, М.М.Круталевіча, А.А.Лукашанца, 2000, і інш.); уласна С., ці С. лексем (пераважная большасць айч. даведнікаў); С. паняццяў (тэрміналагічныя, энцыклапедычныя і інш. даведнікі); С. словазлучэнняў («Слоўнік эпітэтаў беларускай літаратурнай мовы» М.Пазнякова, 1988), фразеалагізмаў («Фразеалагічны слоўнік беларускай мовы» І.Я.Лепешава, т. 1—2, 1993), скарачэнняў, параўнанняў, перыфраз, асацыяцый і да т.п. Асобную групу складаюць парэміялагічныя С., у якіх падаюцца (часам з тлумачэннямі і ілюстрацыямі з маст., публіцыст., навук. і інш. твораў) завершаныя сказы на бел. мове. Да гэтай групы адносяцца С. прыказак і прымавак («Слоўнік беларускіх прыказак» Лепешава і М.А.Якалцэвіч, 1996), крылатых выразаў і афарызмаў («Крылатыя словы і афарызмы» Ф.М.Янкоўскага, 1960), цытат і да т.п. У залежнасці ад таго, якія ўласцівасці слоў апісваюць С., яны падзяляюцца на частотныя («Частотны слоўнік беларускай мовы» Н.С.Мажэйкі і А.Я.Супруна, вып. 1—5, 1976—92); арфаграфічныя (гл. *Арфаграфічны слоўнік*), у якіх падаецца напісанне і акцэнталагічная характарыстыка слоў бел. мовы; дыялектныя (гл. *Дыялектны слоўнік*); гістарычныя (гл. *Гістарычны слоўнік*); этымалагічныя (гл. *Этымалагічны слоўнік*); перакладныя, якія падаюць іншамоўныя адпаведнікі да бел. слоў; С. іншамоўных слоў (гл. *Іншамоўных слоў слоўнік*); С. мовы пісьменніка (гл. *Слоўнік мовы пісьменніка*).

Асобную групу складаюць т.зв. сінанімічныя С. (гл. *Сінонімаў слоўнік*), у якіх уласцівасць слова апісваецца шляхам вызначэння яго суадносін з інш. словамі (сінонімамі, антонімамі, амонімамі, паронімамі, аднакарэннымі словамі, паралексамі і г.д.). Напр., у «Слоўніку сінонімаў і блізказначных слоў» М.К.Клышкі (2-е выд., 1993) апісана каля 1900 сінанімічных радоў з 11 тыс. бел. слоў; у «Слоўніку

амонімаў беларускай мовы» В.Дз.Старычонка (1991) тлумачыцца 2 тыс. пар ці груп амонімаў, аднолькавых па гучанні, але розных па значэнні. Слоўнік «Цяжкія выпадкі ўжывання блізкіх па гучанню слоў» (1977) і «Слоўнік паронімаў беларускай мовы» (1994) С.М.Грабчыкава праз тлумачэнні і ілюстрацыі высвятляюць узаемаадносіны паміж словамі-паронімамі, блізкімі па гучанні, але рознымі па значэнні.

Вылучаюць С. а г у л ь н а л і т а р а т у р н а й м о в ы, у якія з кожнай галіны навукі і вытворчасці ўключаецца па некалькі дзесяткаў найб. вядомых тэрмінаў са спец. стыліст. паметамі абмежавальнага характару. Тэрміны і наменклатурныя назвы найб. поўна і сістэмна апісваюцца ў спец. т э р м і н а л а г і ч н ы х С. У адпаведнасці з мэтамі, якія ставіць перад сабой карыстальнік, вылучаюцца бел. С. а к т ы ў н а г а т ы п у (спрыяюць пабудове чытачом свайго тэксту); С. п а с і ў н а г а т ы п у (дапамагаюць зразумець чужы тэкст); у н і в е р с а л ь н ы я С. (разлічаны на ўсе катэгорыі чытачоў), а с п е к т н ы я С., якія падаюць толькі пэўны тып інфармацыі пра слова (большасць С. бел. мовы) і інш.

Літ.: Словари, изданные в СССР: Библиогр. указ., 1918—1962. М., 1966; Библиогр. указатель словарей изд-ва «Сов. Энциклопедия», 1928—1966. М., 1967; Dictionaries: An international encyklopedia of lexicography. Vol. 1—3. Berlin; New York, 1989—91.

В.К.Шчэрбін.

СЛО́ЎНІК ПСЕЎДАНІ́МАЎ, літаратуразнаўча-бібліяграфічны даведнік, дзе раскрываюцца *псеўданімы* і крыптанімы пісьменнікаў, артыстаў і інш., пад якімі яны выступаюць у друку, на сцэне і г.д. Часта ўключае плагіяты, дзявочыя прозвішчы аўтараў жанчын мае паказальнік аўтараў, дзе пералічваюцца іх псеўданімы і крыштанімы. Расшыфроўка псеўданімаў і крыптанімаў у іх найчасцей наступныя: псеўданім і яго раскрыццё (прозвішча, імя, імя па бацьку аўтара); месца выкарыстання псеўданіма (перыяд. выданне, творы ці агульнае ўказанне на час і месца яго паяўлення); крыніца, паводле якой псеўданім расшыфраваны (друкаваная, архіўная, вусная).

Першыя С.п. з'явіліся ў 16 ст. («Багаслоўскія тлумачэнні» Г.Геснера, 1549). У 17 ст



Да арт. **Слоўнік**. Беларускія слоўнікавыя выданні 1980—90-х г.

СЛО́ЎНІК МО́ВЫ ПІСЬМЕ́ННІКА, тып слоўніка, у якім падаюцца і тлумачацца словы, выкарыстаныя ў творах пэўнага аўтара або якім-небудзь адным яго творы, своеасаблівы дапаможнік для вывучэння моўнага і літ. стыляў пісьменніка, гісторыі літ. мовы той эпохі, калі пісьменнік жыў, для вызначэння яго месца і ролі ў літ.-моўным працэсе. Першы ўсх.-слав. слоўнік пісьменніка — «Слоўнік да твораў і перакладаў Дз.І.Фанвізіна» К.Пятрова (1904). Выдадзены «Слоўнік мовы Пушкіна» (т. 1—4, 1956—61), «Слоўнік мовы А.Міцкевіча» (т.1—11, 1962—83), «Слоўнік мовы Шаўчэнкі» (т. 1—2, 1964), «Слоўнік Гётэ» (т. 1—2, 1966—82). На Беларусі складанне такіх слоўнікаў пачалося ў 2-й пал. 20 ст., першы з іх — рукапісны «Слоўнік мовы В.Дуніна-Марцінкевіча» С.М.Грабчыкава (каля 5600 слоў; фрагменты апубл. ў 1965). Створаны «Слоўнік мовы Францыска Скарыны» У.В.Анічэнкі (т. 1—3, 1977—94), «Фразеалагічны слоўнік мовы твораў Я.Коласа» (1993). Выдаецца «Слоўнік мовы Янкі Купалы» ў 8 т. (т. 1—3, 1997—2001). Ін-т мовазнаўства Нац. АН Беларусі рыхтуе «Слоўнік мовы Я.Коласа».

І.У.Саламевіч.

пачалося сістэматычнае збіранне і выданне псеўданімаў («Пра пісьмовыя сімвалы, што захоўваюць імёны» І.Саўэрса, 1652; «Пра зменены імёны аўтараў і ананімы» Ф.Гейслера, 1669). У 1806—09 А.Барб'е выдаў 4-томны слоўнік франц. псеўданімаў. Найб. вядомыя С.п.: англ. Д.Кенэдзі, А.Сміта, А.Джонсана (т. 1—4, 1926—30), літоўскія В.Біржышкі (1943), Ю.Буценаса (1981), франц. Г.Костана (1961), груз. Г.Мікадзе (1966, 1969), азерб. Г.Мамедлі, Н.Макеева (абодва 1977), эст. М.Каху (1978), узб. Т.Караева і Р.Вахідава (1978, 1979) і інш. На слав. землях працы з пералічэннем псеўданімаў з'явіліся ў 18 ст. («Бібліятэка польскіх паэтаў, што пішуць роднаю моваю» Ю.А.Залускага, 1754), у Расіі — у пач. 19 ст. («Сістэматычны агляд літаратуры ў Расіі на працягу пяцігоддзя з 1801 да 1806 г.» А.Шторха і Ф.Адэлунга, 1810—11). Першы С.п. у Расіі — «Вопыт слоўніка псеўданімаў рускіх пісьменнікаў» В.Карцава і М.Мазаева (1891). Найб. грунтоўныя слав. С.п.: чэш. і славацкія А.Даленскага (1934), І.Орміса (1944), І.Кунца (1958), І.Воправіла (1973), польскія А.Бара (т. 1—3, 1936—38), калект. «Слоўнік псеўданімаў польскіх пісьменнікаў» (т. 1—4, 1994—96), рус. «Слоўнік псеўданімаў рускіх пісьменнікаў, вучоных і грамадскіх дзеячаў» І.Масанава (т. 1—3, 1941—49, т. 1—4, 2-е выд. 1956—60, больш за 80 тыс. псеўданімаў і крыптанімаў), венг. Пала Гуяша (1956), балг. І.Багданава (1961), укр. А.Дэя (1969).

На Беларусі першая публікацыя бел. псеўданімаў — «Літаратурныя працы Ц.Гартнага» Ю.Бібілы (у кн. «Цішка Гартны ў літаратурнай крытыцы», 1928). У «Слоўніку беларускіх псеўданімаў і крыптанімаў (XVI—XX стст.)» Я.Саламевіча (1983) расшыфраваны 3992 псеўданімы і крыптанімы 1231 аўтара.

Літ.: Гл. да арт. *Псеўданім.* *І.У.Саламевіч.*

СЛО́ЎНІКАВЫ СКЛАД МО́ВЫ, гл. *Лексіка.*

СЛОЎСТ, С л о ў с ц ь, рака ў Мінскім і Чэрвеньскім р-нах, правы прыток р. *Волма* (бас. р. Дняпро). Даўж. 22 км. Пл. вадазбору 162 км². Пачынаецца за 1 км на ПдЗ ад в. Лебядзінец Мінскага р-на, вусце за 1,5 км на ПдУ ад в. Карзуны Чэрвеньскага р-на. Рэчышча каналізаванае.

СЛУ́ГІ, с я л я н е - с л у г і, катэгорыя сялян у ВКЛ у 15—18 ст., асн. павіннасцю якіх было выкананне спец. службаў. Да С. належалі вайсковыя сяляне (*панцырныя баяры*, *путныя баяры*, *выбранцы*, служкі і інш.), адм.-гасп. службовыя сяляне (*старцы*, *войты*, *цівуны* і інш.), прыслуга (кухары, півавары і інш.), прамыславікі (*асочнікі*, *баброўнікі*, *стральцы*, конюхі, рыбаловы і інш.), вясковыя рамеснікі (кавалі, цесляры, ганчары, калеснікі, кушняры і інш.). З-за спецыфічнасці сваіх павіннасцей С. мелі больш высокі ў параўнанні з інш. сялянамі сац. статус, але ён не вызваляў іх ад прыгоннага права. С. выконвалі на карысць уласніка комплекс павіннасцей, у які ўваходзіла асн. служба (ад якой С. атрымоўвалі сваю назву) і дадатковыя павіннасці (дзякла, талокі і інш.). С. плацілі ўстаноўленыя дзярж. падаткі. З далучэннем у канцы 18 ст. Беларусі да Рас. імперыі С. паступова зліліся з асн. масай сялянства.

А.Б.Доўнар.

СЛУ́ЖБА, 1) сялянскі зямельны ўчастак у ВКЛ да аграрнай рэформы Жыгімонта II Аўгуста 1-й пал. — сярэдзіны 16 ст.; адна з адзінак абкладання сялян феад. павіннасцямі (побач з *дворышчам*). Звычайна С. знаходзілася ва ўладанні і карыстанні 2 і болей двароў. 2) Асн. адзінка абкладання феад. павіннасцямі сялян-даннікаў у 16 ст., у пад-

няпроўскіх валасцях — да пач. 17 ст. 3) Адзінка для вымярэння вайсковай службы баяр-шляхты ў 15—16 ст., роўная сялянскай С. З 1502 у войска выстаўлялі 1 конніка ад 10 С., з 1521 — ад 5 С. У 1528 з кожных 8 С. баярын-шляхціц павінен быў выстаўляць 1 конніка, першым коннікам быў ён сам. У 1529 выстаўляўся коннік ад 8 С., пры горшым узбраенні — ад 1 да 7 С., у 1544 — ад 10 С. *А.П.Грыцкевіч.*

СЛУ́ЖБА ВЯРХО́ЎНАГА КАМІСА́РА ААН ПА СПРА́ВАХ БЕ́ЖАНЦАЎ (Office of the United Nations High Commissioner for Refugees). Засн. Ген. асамблеяй ААН у 1951 замест Міжнар. арг-цыі па справах бежанцаў. Займаецца асобамі, якія падыходзяць пад вызначэнне *бежанцаў* або прымусовых перасяленцаў (паводле Канвенцыі 1951 пра статус бежанца, Пратакола 1967 да яе і Рэзалюцыі ААН ад 1985): што пакінулі радзіму па розных прычынах (вайна, праследаванні расавыя, рэліг., паліт. і інш.). Гал. кірунак дзейнасці — рэпатрыяцыя бежанцаў і прымусовых перасяленцаў, іх інтэграцыя ў грамадстве, уладкаванне на старых або новых месцах жыхарства. Служба дапамагла ўладкавацца больш чым 30 млн. прымусовых перасяленцаў. Паводле звестак на 1995 пад апекай службы знаходзілася каля 27 млн. чал., з іх 14,5 млн. — ахвяры ваен. канфліктаў. Нобелеўскія прэміі міру 1954 і 1981.

СЛУ́ЖБА НАДВО́Р'Я, сістэма забеспячэння інфармацыяй насельніцтва і розных галін нар. гаспадаркі ад стане *надвор'я* і *прагнозамі надвор'я*. Выкарыстоўвае звесткі рэгулярных назіранняў *метэаралагічных станцый*, *гідралагічных станцый*, *метэаралагічных пастоў*, аналагічную інфармацыю ад інш. рэгіёнаў, а таксама вынікі радыёзандзіравання атмасферы, назіранні *метэаралагічных спадарожнікаў* і радыёлакатараў. Усю інфармацыю наносяць на *сінаптычныя карты*, якія з'яўляюцца гал. крыніцай для складання прагнозу надвор'я. Інфармацыя аб стане надвор'я, прагнозы і штармавыя папярэджанні перадаюцца зацікаўленым арг-цыям, распаўсюджваюцца праз радыё, тэлебачанне і друк. С.н. забяспечвае таксама нар. гаспадарку звесткамі аб ступені спрыяльнасці будучага надвор'я для развіцця с.-г. культур, правядзення с.-г. работ (гл. *Аграметэаралагічны прагноз*), аб узроўнях вады на рэках і вадаёмах і прагнастычным развіцці гідралаг. працэсаў (гл. *Гідралагічны прагноз*). Існуе амаль ва ўсіх краінах. Міжнар. супрацоўніцтва ажыццяўляецца з дапамогай сусв. С.н. На Беларусі засн. ў 1924. Функцыі С.н. выконвае Рэсп. гідраметэаралагічны цэнтр.

СЛУ́ЖБА СО́НЦА, сістэматычныя назіранні *Сонца* для атрымання інфармацыі пра з'явы, што адбываюцца ў яго атмасферы. Праводзяцца па міжнар. праграме спец. сеткай астр. станцый і абсерваторый. Даследуецца *сонечная актыўнасць* і яе ўплыў на геафіз. працэсы, а таксама сонечныя плямы, іх магн. палі, храмасферныя ўспышкі, *пратуберанцы*, валокны, *сонечная карона*, *радыёвыпрамяненне Сонца* і інш. Звесткі публікуюцца ў выглядзе карт, табліц і графікаў (для кожнага дня назіранняў), за больш працяглыя перыяды часу — у каталогах. Даныя С.С. выкарыстоўваюцца як для практычных мэт (прагнозы ўмоў радыёсувязі, магн. бур, касм. радыяцыйнага становішча і інш.), так і для даследавання прыроды сонечнай актыўнасці. *А.А.Шымбалёў.*

СЛУ́ЖБА ЧА́СУ, сукупнасць работ па вызначэнні і захоўванні дакладнага *часу* і перадачы інфармацыі аб ім; аб'яднанне астр. устаноў краіны, якія вядуць адпаведныя работы. Устанаўлівае сувязь паміж сусветным часам (вызначаецца з астр. назіранняў) і атамным часам (вызначаецца пры дапамозе *квантавага гадзінніка*, недакладнасць ходу якога каля 1 с за сто гадоў). Захоўванне часу паміж назіраннямі выконваецца пры дапамозе *кварцавых гадзіннікаў*, якія кантралююцца атамнымі і малекулярнымі стандартамі частаты з дакладнасцю, на 3—4 парадкі вышэйшай за дакладнасць вызначэння сусветнага часу. Для праверкі часу праз радыёвяшчальную сетку кожную гадзіну перадаюць 6 сігналаў, апошні з якіх адпавядае дадзенай гадзіне. Работу С.ч. розных краін каардынуе Міжнар. бюро часу пры Парыжскай абсерваторыі, якое па іх матэрыялах вылічвае і публікуе канчатковыя папраўкі радыёсігналаў. Міжнар. шкала атамнага часу рэалізуецца шляхам усярэднення паказанняў некалькіх дзесяткаў атамных гадзіннікаў С.ч. ў розных краінах. *А.А.Шымбалёў.*

СЛУ́ЖБА ШЫРАТЫ́, сістэматычнае вызначэнне геагр. шыраты пэўнага пункта зямной паверхні (гл. *Геаграфічныя каардынаты*); аб'яднанне астр. устаноў, якія праводзяць адпаведную работу. Даследуе змены шырот ад руху *полюсаў геаграфічных* для вызначэння заканамернасцей і прычын гэтага руху, а таксама для патрэб геадэзіі і *службы часу*. Кіраўніцтва С.ш. ажыццяўляе міжнар. служба руху полюса (раней — міжнар. С.ш.), у даследаваннях удзельнічаюць больш за 40 абсерваторый свету.

СЛУЖБО́ВАЯ Э́ТЫКА, сістэма норм паводзін, якія рэгулююць адносіны чалавека да сваіх прафес. абавязкаў, маральныя ўзаемаадносіны спецыялістаў і аб'ектаў іх дзейнасці (урач і хворы, педагог і вучань і г.д.), узаемаадносіны людзей у прац. дзейнасці. Нормы С.э. выпрацоўваюцца з улікам сац. структуры *грамадства*, інтарэсаў груп, сістэм *грамадскіх адносін* і ўяўлення членамі грамадства аб належным, дапушчальным, магчымым, станоўчым, жаданым, прымальным і г.д. З дапамогай гэтых норм грамадства, сац. групы прад'яўляюць сваім прадстаўнікам патрабаванні, якім павінны адпавядаць іх паводзіны, кантралююць, рэгулююць, ацэньваюць гэтыя паводзіны. Да спецыялістаў, ад якіх залежыць жыццё і здароўе людзей (медыцына, транспарт і г.д.) або якія маюць права ўмешвацца ва ўнутраны свет чалавека (педагогіка, псіхіятрыя і інш.), прад'яўляюцца павышаныя патрабаванні. Існуюць такія паняцці, як урачэбная этыка, журналісцкая этыка і інш. У сучасным грамадстве асобае значэнне надаецца прадпрымальніцкай этыцы, якая ўключае этыку вядзення перагавораў, канкурэнтнай барацьбы і г.д.

СЛУЖБО́ВЫЯ САБА́КІ, група парод свойскіх сабак рознага паходжання, якіх выкарыстоўваюць для аховы жылля, гасп., ваен. і інш. аб'ектаў, пасьбы жывёл, у спарт. і трансп. мэтах і інш. Вядома каля 100 парод. На Беларусі найб. пашыраны *аўчаркі*, *баксёры*, *догі*, *лайкі*, *ньюфаўндленды*, *пінчэры*, *ратвейлеры*, *сенбернары* і інш.

СЛУЖБО́ВЫЯ СЛО́ВЫ, непаўназначныя словы, якія служаць для выражэння розных сэнсава-сінтакс. адносін паміж самастойнымі словамі, сказамі або часткамі сказа, не называюць прадметаў або прыкмет, не маюць марфалагічных катэгорый, не з'яўляюцца членамі сказа і ўжываюцца толькі з паўназначнымі словамі. У бел. мове паводле функцыянальнага прызначэння і ролі ў мове аб'ядноўваюцца ў *звязкі*, *злучнікі*, *прыназоўнікі*, *часціцы*. Не маюць уласнага націску, аб'ядноўваюцца ў адну акцэнталагічную адзінку з суседнім словам, выступаючы як праклітыка (перад апорным націскным паўназначным словам — «ішоў **па** дарозе») ці энклітыка (пасля такога слова — «перайшоў **бы** дарогу»). Усе С.с., акрамя звязкі, нязменныя. Складаюцца звычайна з адной каранёвай марфемы. Асн. С.с. паходзяць ад паўназначных, аднак пераважна гэта даказвае этымалагічны або гіст. аналіз. З пункту погляду сучасных моўнаўцаў вял. колькасць С.с. — невытворныя. Могуць пераходзіць у разрады формаўтваральных ці словаўтваральных афіксаў (прыстаўкі, суфіксы, постфіксы). Характарызуюцца высокай частотнасцю ў моўнай плыні.

Літ.: Беларуская граматыка. Ч. 1. Мн., 1985; Шуба П.П. Сучасная беларуская мова: Марфаналогія. Марфалогія. Мн., 1987.

П.П.Шуба.

СЛУЖЫ́ЛЫЯ ЛЮ́ДЗІ, агульная назва асоб, якія знаходзіліся на дзярж. службе ў Рас. дзяржаве ў 14—18 ст. Напачатку С.л. Маскоўскага княства 14 — пач. 16 ст. былі асабіста несваводнымі людзьмі, якія неслі ваен. ці адм. службу ў князёў і баяр. На час службы яны атрымлівалі ад сваіх уладальнікаў ва ўмоўнае карыстанне зямлю. У сярэдзіне 15—16 ст. С.л. называлі *кабальных халопаў*. У 16 — пач. 18 ст. С.л. — асабіста свабодныя людзі, абавязаныя несці дзярж., ваен. ці адм. службу. Яны падзяляліся на С.л. «па бацькаўшчыне» (спадчынныя) і «па прыборы». У групу «па баць-

каўшчыне» ўваходзілі чыны: баярскія (*баяры, акольнічыя*, думныя дваране і дзякі), маскоўскія (феадалы на службе пры двары і найвышэйшыя чыноўнікі прыказаў), гарадавыя (феадалы на дзярж. службе ў правінцыі ці войску). За службу яны мелі права валодаць зямлёю і прыгоннымі, атрымлівалі грашовую ці зямельную плату. Да групы «па прыборы» належалі *стральцы*, гарадавыя казакі, пушкары, радавыя салдацкіх і драгунскіх палкоў. Яны атрымлівалі ад дзяржавы плату грашыма і хлебам (у некат. раёнах зямлёю), вызваляліся ад большасці падаткаў і павіннасцей, мелі прывілеі ў гандлі і рамястве. Тэрмін «С.л.» выйшаў з ужытку ў пач. 18 ст. ў сувязі з рэформамі ў дзярж. апараце і арміі.

СЛУЖЭ́БНІКІ, с л у г і, ніжэйшая катэгорыя службовых асоб дзярж. або прыватнаўласніцкага кіравання ў ВКЛ у 14—17 ст. С. маглі быць шляхціцы, мяшчане, баяры і сяляне. Вышэйшую іх групу складалі *дваране* пры велікакняжацкім двары. С. былі пісарамі, дворнымі слугамі, збіралі даніну, прыводзілі ў выкананне пастановы органаў дзярж. кіравання і суда, наглядалі за пабудовай і рамонтам замкаў, мастоў, дарог, за парадкам у судах (*возны, віж*). «Устава на валокі» 1557 рэгламентавала правы і абавязкі сельскіх службовых асоб, якія карысталіся за службу 2 вольнымі ад павіннасцей валокамі зямлі. У гарадах меліся слугі месцкія, магістрацкія, купецкія. *Я.А.Юхо.*

СЛУКА́ Алег Георгіевіч (н. 12.7.1941, в. Лабковіца Асіповіцкага р-на Магілёўскай вобл.), гісторык, дзярж. дзеяч. Д-р гіст. н. (1986), праф. (1989). Скончыў БДУ (1968), дзе і працаваў з 1971 (з 1986 дэкан ф-та журналістыкі). З 1995 пам. Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, у 1997—2001 нам. міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь, з 2002 рэктар Міжнар. гуманітарна-эканам. ін-та. Даследуе пытанні гісторыі, тэорыі і практыкі сродкаў інфармацыі, тэорыі ідэалогіі бел. дзяржаўнасці. Аўтар вучэбнага дапаможніка «Беларуская журналістыка» (ч. 1, 2000).

Тв.: Голос революционной молодежи. Мн., 1978; Слово в комсомольском строю. Мн., 1980; Комсомольская строка. Мн., 1984; Модель устойчивого развития Республики Беларусь. Мн., 1999 (у сааўт); Нацыянальная ідэя: Сістэмны аналіз праблемы. Мн., 2001.

СЛУКА́ Барыс Аляксандравіч (н. 12.4.1946, г. Ліда Гродзенскай вобл.), бел. вучоны ў галіне гісталогіі і эмбрыялогіі. Д-р біял. н. (2000), праф. (2001). Скончыў Мінскі мед. ін-т (1970), дзе і працуе (з 1997 заг. кафедры). Навук. працы па заканамернасцях сістэмнай арганізацыі тканак і органаў дыхання, колькасных і стат. характарыстык мікраструктур, матэм. мадэліраванні гістагенет. працэсаў.

Тв.: Кариометрическая характеристика тканей легкого крысы при пренатальном развитии // Морфология. 1993. Т. 104, № 1/2; Количественная характеристика ростовых процессов в эмбриональном легком крысы // Количественная морфология развивающегося организма. Мн., 1998; Морфология легких при химической десимпатизации. Мн., 2000; Основы возрастной гистологии. Мн., 2000 (разам з А.С.Леанцюком). *А.С.Леанцюк.*

СЛУПКАВА́ТАЯ ТКА́НКА ў б а т а н і ц ы, тое, што *палісадная тканка*.

СЛУПНЯ́К, цяжкае інфекцыйнае захворванне чалавека і жывёл, якое характарызуецца прыступамі сутаргавых скарачэнняў мускулатуры. Апісаны *Гіпакратам*. Выклікаецца слупняковай палачкай, якую адкрыў ням. ўрач А.Нікалаер (1884); іх споры могуць знаходзіцца ў кішэчніку жывёл, птушак, чалавека, у глебе. Пранікаюць у арганізм пры траўмах (рана, апёкі, трэшчыны і інш.). На месцы ўкаранення ўзбуджальнік пачынае размнажацца і выдзяляць таксіны з нейратропнымі ўласцівасцямі, якія выклікаюць паталаг. ўзбуджэнне клетачных элементаў.

У чалавека вылучаюць 4 формы С.: генералізаваную, лакальную, энцэфалітычную, неанатальную. Прыкметы: боль у ране, паторгванне мышцаў вакол яе, агульная патлівасць, сутаргі жавальных (трызм), мімічных («сарданічная ўсмешка») і дыхальных мышцаў. Далейшае развіццё С. прыводзіць да гіпертонусу доўгіх мышцаў спіны, жывата і канечнасцей. Сутаргі суправаджаюцца частым пульсам, прытомнасць захоўваецца. Моцныя гукі, святло, кашаль і інш. вонкавыя і ўнутр. раздражняльнікі ўзмацняюць сутаргі. У ж ы в ё л назіраецца напружанне жавальных мышцаў, пазней сутаргі ўсіх мышцаў, агульнае здранцвенне. Хворых на С. жывёл ізалююць і лечаць (антыбіётыкі і інш.).

А.А.Астапаў.

СЛУПСК (Słupsk), горад на ПнЗ Польшчы, каля ўзбярэжжа Балтыйскага м., у Паморскім ваяводстве. Каля 120 тыс. ж. (2001). Вузел чыгунак і аўтадарог. Авангорт на Балтыйскім м. — г. Устка. Прам-сць: машынабудаванне, у т.л. сельскагаспадарчае; металаапрацоўчая (карабельная арматура), абутковая, швейная, мэблевая, харчовая. Помнікі гатычнай архітэктуры 14—16 ст. (касцёл, замак і інш.).

СЛУПСКАЕ ВАЯВО́ДСТВА (Województwo Słupskie), былая адм.-тэр. адзінка на Пн Польшчы. З 1999 у складзе *Паморскага ваяводства*.

СЛУ́ПСКІ Аляксандр Іванавіч (16.4.1864, г. Слуцк, Мінскай вобл. — пасля 1907), бел. і расійскі гісторык і археолаг. Скончыў Мінскую гімназію, Пецярбургскі ун-т (1887). Пад яго рэдакцыяй у Мінску выйшлі «Паўночна-Заходнія календары...» на 1892 і 1893, у якіх змешчаны «Народны каляндар», складзены на аснове нар. прыкмет беларусаў, тэкстаў бел. абрадавых песень, прыказак; апубл. шмат твораў Я.Лучыны на бел. мове. У календары на 1893 змешчаны артыкулы С. «Гісторыя Мінска», «Легенда пра Магілёў». У 1880—90-я г. выступаў у газ. «Минские губернские ведомости», «Минский листок» і інш. з артыкуламі па гісторыі Беларусі, гісторыі рус. л-ры. У арт. «Стары Мінск» (1895) прывёў біягр. звесткі пра В.І.Дуніна-Марцінкевіча, запісаныя ад дачок пісьменніка. З 1893 жыў на Урале; працаваў земскім начальнікам у Пермскай губ. У 1901—05 член Пермскай губ. архіўнай камісіі. Даследаваў пытанні гісторыі культуры і архітэктуры Расіі («Архітэктурныя помнікі Салікамска», 1902; «Падземныя хады Салікамска», 1904; «Да пытання аб маскоўскім і наўгародскім уплыве ў архітэктурных помніках Салікамска і Чэрдыні», 1905).

Тв.: Изяславль и Туров — рассадники христианства, основанные Владимиром Св. в нынешней Белоруссии. Мн., 1888.

І.У.Саламевіч.

СЛУЦК, горад абл. падпарадкавання, цэнтр Слуцкага р-на Мінскай вобл., на р. Случ. Вузел чыгунак на Асіповічы, Баранавічы, Салігорск, аўтадарог на Бабруйск, Мінск, Салігорск. За 105 км на Пд ад Мінска. 63,4 тыс. ж. (2001).

С. (летапісны Случеск) упершыню ўпамінаецца ў «Аповесці мінулых гадоў» пад 1116, як адзін з гарадоў Тураўскай зямлі. З 1160 цэнтр удзельнага *Слуцкага княства*. З 1320—30-х г. у складзе ВКЛ. З 1395 уласнасць Алелькавічаў, пазней — Радзівілаў, Л.П.Вітгенштэйна, з 1847 дзярж. ўласнасць. У 15 ст. буйны феад. горад, меў Верхні, Ніжні і Новы замкі (гл. *Слуцкія замкі*). У 1433 цэнтр выступлення бел. феадалаў супраць вял. кн. *Жыгімонта Кейстутавіча*. У 1441 атрымаў гар. самакіраванне і магдэбургскае права. У пач. 16 ст. ў выніку нападаў крымскіх татараў разбураны, страціў самакіраванне. З 1507 у На-



Слуцк. Жылыя дамы ў цэнтры горада.

вагрудскім пав. З 1586 дзейнічала правасл. брацтва пры Праабражэнскім манастыры, з 17 ст. — Успенскае брацтва. У 1593 каля 7 тыс. ж., каля 1100 двароў. У ліст. 1595 быў захоплены казакамі С.Налівайкі. У 1630—40 кн. Багуслаў Радзівіл ператварыў С. у горад-крэпасць. Пры княжацкім двары вёўся *Слуцкі летапіс*, была бібліятэка, на падставе кніг і летапісу якой напісаў сваю «Хроніку» М.*Стрыйкоўскі*. У час антыфеад. вайны 1648—51 у жн. 1648 горад вытрымаў асаду казацка-сял. атрада. 27.8.1652 зноў нададзена (спачатку часткова, 9.9.1700 канчаткова) магдэбургскае права, герб «Пагоньчык». З пач. 17 ст. працавалі школы кальвінісцкая, для гараджан, з 1624 гімназія, з 1689 — *Слуцкі езуіцкі калегіум* і інш. З 1672 дзейнічала *Слуцкая друкарня*. У час вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—67 С. у 1655 — адзіны буйны горад Беларусі, што вытрымаў аблогу рас. і казацкіх войск. Таму 7.5.1656 Б.Хмяльніцкі выдаў універсал з гарантыяй недатыкальнасці С. з боку казацкіх атрадаў, а слуцкім купцам — вольнага гандлю на Украіне. У 1683 каля 9 тыс. ж., у 1777 працавалі 18 рамесных цэхаў, папяровая ф-ка, суконная, палатняная мануфактуры, *Слуцкая мануфактура шаўковых паясоў*, арганізавана *Слуцкая канфедэрацыя 1767*. У 1785 у С. рэзідэнцыя епіскапа В.Садкоўскага, у 1785 адчынена правасл. духоўная школа. Да канца 18 ст. горад паступова страчваў эканам. значэнне, колькасць насельніцтва скарацілася да 5,5 тыс. чал. З 1791 цэнтр *Случарэцкага павета* Навагрудскага ваяв. З 1793 у Рас. імперыі, цэнтр *Слуцкага павета* Мінскай губ. У 1897 у С. 14 349 ж., 3 заводы. У 1-ю сусв. вайну павет стаў прыфрантавым, таму ў 1915 для забеспячэння фронту да С. пракладзена чыгунка з Асіповічаў. У лютым 1918 заняты корпусам Ю.*Доўбар-Мусніцкага* і герм. войскамі. У 1918 дзейнічаў Бел. нац. к-т, *Слуцкая беларуская гімназія*, культ.-асв. арг-цыя *«Папараць-кветка»*. З 1.1.1919 у БССР, з 27.2.1919 у Літ.-Бел. ССР. З 10.8.1919 да 15.7.1920 заняты польск. войскамі. Дзейнічалі падп. к-ты кампартыі Літвы і Беларусі, падп. група партыі бел. эсэраў, партыз. атрады бальшавікоў і эсэраў, аднавілася дзейнасць Бел. нац. к-та, для самаабароны ўтворана нар. міліцыя. У ліст.—снеж. адбылося *Слуцкае паўстанне* 1920. У 1924—27 і 1935—38 цэнтр *Слуцкай акругі*, з 17.7.1924



Да арт. **Слуцк**. Помнік княгіні Соф'і Слуцкай. Скульптар М.Іньковў. 2000.

Слуцкага раёна. У 1939 21 947 ж. У Вял. Айч. вайну 27.6.1941 акупіраваны ням. фашыстамі, якія ў горадзе і раёне знішчылі 25 584 чал., стварылі ў С. 3 лагеры смерці, дзе загубілі каля 20 тыс. чал.; дзейнічала *Слуцкае патрыятычнае падполле*, партыз. злучэнне Слуцкай зоны. Горад вызвалены 30.6.1944 войскамі 1-га Бел. фронту сумесна з партызанамі ў ходзе *Мінскай аперацыі 1944*. У 1970 — 35,6 тыс. жыхароў.

Працуюць *Слуцкі кансервавы завод, Слуцкі цукрова-рафінадны камбінат, Слуцкі мясакамбінат*, сыраробчы і хлебапрадуктовы камбінаты, хлебазавод, піваварны з-д, макаронная ф-ка, *Слуцкае прадпрыемства мастацкіх вырабаў «Слуцкія паясы»*, ільнозавод, тэкстыльная і па пашыве адзення ф-кі, з-ды «Эмальпосуд», жалезабетонных вырабаў і інш. Дзейнічаюць 12 сярэдніх, спарт., муз., маст. школы, гімназія, цэнтр тэхн. і прыкладной творчасці, станцыі юных натуралістаў і турыстаў, спарткомплекс «Дэльфін»; Дом культуры, Дом моладзі, *Слуцкі краязнаўчы музей*, кінатэатр «Беларусь»; бальніца; 2 царквы, 2 капліцы, касцёл.

Стары горад — найб. стараж. ч. горада з замкамі на правым беразе Случы. Напачатку развіваўся ва ўсх. напрамку. Паміж пасадам і замкам знаходзілася гандл. плошча, у 1419 тут пабудаваны фарны касцёл. У канцы 15 ст. С. пачаў расці ў зах. напрамку, расшырыўся і на Пн, фарміраваўся як горад з радыяльна-кальцавой планіроўкай. Новы горад — левабярэжжа, паўд. ч. горада, забудоўвалася пазней, у 16 ст. тут склалася прамавугольная сетка вуліц з вял. кварталамі, забудаванымі драўлянымі дамамі. Абедзве ч. горада злучаліся паміж сабой мостам, на якім размяшчаліся млыны. Прадмесце С. — Востраў — знаходзілася за гар. ўмацаваннямі на ПнУ ад горада. Уніз па цячэнні Случы, на яе правым беразе, было прадмесце Трайчаны — пасяленне вакол *Слуцкага Троіцкага манастыра*. Пры Радзівілах пабудаваны новыя абарончыя ўмацаванні, цытадэль, распрацаваны рэгулярны план Новага горада. У 1630—40-я г. С. ператвораны ў горад-крэпасць, умацаваны земляными валамі і ровам, бастыёнамі і равелінамі. Уваходы ў горад былі праз Віленскую, Капыльскую і Астроўскую мураваныя брамы з пад'ёмнымі мастамі, а таксама драўляную Навамейскую браму. У канцы 17—18 ст. пабудаваны касцёлы езуітаў (не захаваліся) і *Слуцкі езуіцкі калегіум*, ратуша. У 1840-я г. ў сувязі з буд-вам шашы парушана гіст. планіроўка горада. С. стаў развівацца на З і У, уздоўж шашы ўзводзіліся асн. мураваныя будынкі — паштовая станцыя, будынак дваранскага сходу (абодва класіцызм) і інш. У сярэдзіне 19 ст. ў С. існавалі 8 правасл. цэркваў, у т.л. *Слуцкая Міхайлаўская царква*, цэрквы Троіцкая, Вазнясенская (пабудавана ў 1782), саборная Успенская Мікалаеўская (пабудавана ў 1819 на месцы б. замкавай Прасвятой Багародзіцы 1509), *Слуцкі касцёл і кляштар бернардзінцаў*, 2 каталіцкія капліцы, 2 кальвінісцкія царквы (у 1617 пабудавана драўляная ў Новым горадзе Я.Радзівілам, у 1852 на яе месцы — мураваная, не захавалася), 2 сінагогі. Існавалі *Слуцкі Ільінскі манастыр* і Праабражэнскі мужчынскі манастыр. У канцы 18 ст. пабудаваны мураваны касцёл (не захаваўся). Паводле плана забудовы С. (1823) горад фарміраваўся з 2 частак, падзеленых ракой — яго кампазіцыйнай воссю. План прадугледжваў упарадкаванне вулічнай сеткі, буд-ва новых мураваных дамоў, зліццё цэнтра з ускраінамі. У 20 ст. С. забудоўваўся паводле генпланаў 1940, 1947 (арх. Г.Парсаданаў), 1962 (арх. В.Сушчыц, Н.Вайбовіч, А.Сідзельнікаў; усе ін-т «Белдзяржпраект», карэкціроўка апошняга ў 1971 у Мінскім філіяле ЦНДІПгорадабудаўніцтва, арх. Р.Шэліхава, Т.Купрэева), 1977 (БелНДІПгорадабудаўніцтва, арх. М.Мызнікаў, Шэліхава, Купрэева), праекта дэталёвай планіроўкі 1978 (ін-т «Мінскгрmaдзянпраект», арх. П.Алфімава, А.Кракалёва), генплана 1987 (БелНДІПгорадабудаўніцтва, арх. В.Мусіенка, А.Байрачная). З 1990-х г. пашыраюцца гар. тэрыторыі, перавага аддаецца забудове сядзіб-

ПЛАН ПАВЯТОВАГА ГОРАДА СЛУЦКА 1799 г.



нага тыпу. Зона адпачынку — берагі р. Случ, гар. парк культуры і адпачынку, вадасховішча Рудня.

У 1751—60 у С. дзейнічаў *Слуцкі тэатр Радзівіла*, паказы якога суправаджала *Слуцкая капэла Радзівіла*, працавалі таксама *Слуцкая балетная школа, Слуцкая музычная школа*. У 1936—41 працаваў калг.-саўг. т-р (маст. кіраўнік С.Тураў). Сярод пастановак: «Хто смяецца апошнім» К.Крапівы, «Позняе каханне», «Без віны вінаватыя» і «Жаніцьба Бальзамінава» А.Астроўскага, «Забаўны выпадак» К.Гальдоні і інш. У С. працуюць народныя т-р драмы і камедыі імя У.Галубка гар. Дома культуры (з 1961), маладзёжны т-р эстрады Слуцкага арганізацыйна-метадычнага цэнтра аддзела культуры райвыканкома (з 1990), узорныя т-р лялек «Усмешка» Цэнтра дзіцячай творчасці (з 1993), тэатр. студыя «Мельпамена» пры Цэнтры дзіцячай творчасці (з 1995) і інш. У С. брацкая магіла партызан грамадз. вайны, брацкія магілы сав. воінаў, партызан, ваеннапалонных і мірных жыхароў, магілы ахвяр фашызму. Помнікі: Вызваліцелям, у гонар 50-годдзя сав. улады, Соф'і Слуцкай (скульпт. М.Інькоў, 2000). Помнік археалогіі — гарадзішча стараж. С.



Слуцк. Будынак былога дваранскага сходу.

Літ.: Грицкевич А.П. Слуцк: Ист.-экон. очерк. 2 изд. Мн., 1970; Яго ж. Древний город на Случи. Мн., 1985; Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі: Мінская вобл. Т. 2. Мн., 1987.

А.П.Грыцкевіч (гісторыя, архітэктура), *В.Р.Кукуня, С.Ф.Самбук* (архітэктура).

СЛУ́ЦКАЕ КНЯ́СТВА, 1) удзельнае княства Тураўскай зямлі ў 12—14 ст. Цэнтр — г. *Слуцк*. Вылучылася ў 1160, калі слуцкім князем стаў Уладзімір Мсціславіч, унук Уладзіміра Манамаха. Канчаткова аформілася ў 1190-я г. Тут княжылі нашчадкі тураўскага кн. *Юрыя Яраславіча*. Гэта дынастыя панавала да канца 14 ст. Апошні князь з яе, Юрый, згаданы ў грамаце 1387. У 1320—30-я г. С.к. разам з інш. княствамі Тураўскай зямлі ўвайшло ў склад ВКЛ.

2) Буйное феад. княства ў ВКЛ. Узнікла ў 1395, калі вял. кн. Вітаўт адабраў у кн. Уладзіміра Альгердавіча Кіеўскае княства і даў яму як кампенсацыю Слуцк і Капыль з навакольнымі землямі ў якасці ўдзельнага княства. Да сярэдзіны 15 ст. цэнтрам княства быў Капыль (гл. *Капыльскае княства*), пасля Слуцк. Нашчадкі Уладзіміра Альгердавіча, князі *Алелькавічы* (Слуцкія) валодалі С.к. да 1612. Пасля смерці ў 1612 княгіні Соф'і С.к. перайшло да яе мужа Я.Радзівіла і заставалася ў родзе Радзівілаў, з перапынкам у 1695—1744, калі знаходзілася ў жаночых нашчадкаў Радзівілаў слуцка-біржанскай лініі, княгінь Нойбургскіх.

С.к. займала тэрыторыю паміж р. Нёман на Пн, р. Лань на З, р. Пціч на У і р. Прыпяць на Пд; уключала гарады і мястэчкі Слуцк, Капыль, Шімкавічы, Грэск, Таль, Пагост, Любань, у 16 ст. — і Петрыкаў. Да 16 ст. яно знаходзілася ў васальнай залежнасці ад велікакняжацкай улады. Кіраваў С.к. князь з дапамогай баярскай рады. У слуцкага князя былі свае васалы — князі, баяры і слугі путныя, якія атрымлівалі за службу (вайсковую і адміністрацыйную) маёнткі. У валасцях кіравалі намеснікі князя. У 16 ст. С.к. паступова ператварылася ў вял. феад. вотчыну, але захавала рысы ўдзельнага княства. Да канца 18 ст. заставалася унікальнай адм.-тэр. адзінкай ВКЛ. З 1507 уваходзіла ў Новагародскі пав. і адначасова захоўвала ў адм., суд. і вайск. структурах свае асобныя ўстановы, якія падпарадкоўваліся слуцкаму князю. У 1791 С.к. скасавана, замест яго створаны *Случарэцкі павет*.

А.П.Грыцкевіч.

СЛУ́ЦКАЕ ПАТРЫЯТЫ́ЧНАЕ ПАДПО́ЛЛЕ ў Вялікую Айчынную вайну. Дзейнічала ў кастр. 1941 — лютым 1943 у Слуцку і яго ваколіцах пад кіраўніцтвам падп. Мінскага абкома КП(б)Б і Слуцкага міжрайкома КП(б)Б (з жн. 1942). Складалася з 3 груп (кіраўнікі М.І.Багуноў, М.І.Відзякін, Дз.В.Каўшоў, П.Я.Маглыш, А.Дз.Фамін). Падпольшчыкі трымалі сувязь з партыз. атрадамі В.З.Каржа і імя Фрунзе, вялі агітацыю сярод насельніцтва, прымалі па радыё і распаўсюджвалі зводкі Саюзінфармбюро, здабывалі партызанам разведданыя пра ням. гарнізоны, мерапрыемствы акупантаў, збіралі зброю, дакументы, здабылі і перадалі ім друкарскі шрыфт, фарбу, паперу, праводзілі дывэрсіі, у т.л. на электрастанцыі, мэблевай ф-цы. Да сак. 1943 большасць падпольшчыкаў пайшла ў партызаны. У барацьбе з акупантамі загінула 9 патрыётаў.

Літ.: Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941—1945: Энцыкл. Мн., 1990. С. 566.

А.Б.Рогаў.

СЛУ́ЦКАЕ ПАЎСТА́ННЕ 1920, Слуцкі збройны чын 1920, адзін з актаў узбр. выступлення часткі бел. інтэлігенцыі і сялянства Случчыны супраць палітыкі *«ваеннага камунізму»*. Узначальваў выступленне Бел. нац. к-т у Слуцку. С.п. адбывалася ў канцы польска-сав. вайны 1919—20 (гл. *Савецка-польская вайна 1920*). У Бел. нац. к-це былі прыхільнікі ген. С.Н.Булак-Балаховіча, якія выступалі за саюз з Польшчай, і прадстаўнікі Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў (БПС-Р), што выступалі за поўную незалежнасць і ад Польшчы і ад Расіі; некат. былі схільныя да пагаднення з Сав. Расіяй. Па ініцыятыве прадстаўнікоў БПС-Р 14—15.11.1920 у Слуцку адбыўся бел. з'езд Случчыны (117 дэлегатаў). Кіраваліся з'ездам бел. эсэры, якіх падтрымлівала большасць дэлегатаў. Актыўны ўдзел у рабоце з'езда прымаў П.Я.Жаўрыд, прызначаны *Найвышэйшай радай БНР* камісарам на Случчыне. 14 ліст. з'езд прыняў рэзалюцыю, у якой вітаў Найвышэйшую раду БНР і заявіў пратэст супраць сав. улады на Беларусі як «чужацкай». З'езд абраў *Беларускую раду Случчыны* (БРС) з 17 чал. на чале з У.М.Пракулевічам, даверыў ёй цывільную ўладу ў павеце і даручыў арганізацыю нац. войска. БРС лічылася часовым органам да ўтварэння выбарнага органа на ўсёй Беларусі. Рада складалася з 8 бел. эсэраў на чале з Пракулевічам і прадстаўнікоў інш. паліт. груповак. Першачараговай задачай было фарміраванне войска, для чаго з членаў рады створана тройка на чале з Жаўрыдам. Была сфарміравана 1-я *Слуцкая брыгада* стральцоў у складзе 2 палкоў — 1-га Слуцкага і 2-га Грозаўскага. Баявыя дзеянні пачаліся 27 лістапада Штодзённыя бесперапынныя атакі вяліся на ўчастку працягласцю 60 км; асабліва моцна атакавалі на лініі Капыль—Шімкавічы—Вызна. Баі ішлі каля вёсак Садавічы, Быстрыца, Лютавічы, Морач, мястэчка Капыль, Вызна. Камандаванне 16-й сав. арміі вырашыла ачысціць нейтральную зону ад паўстанцаў. Аднак дзеянні Чырв. Арміі не далі вынікаў, бо камандаванне Слуцкай брыгады вывела гал. сілы з-пад удару сав. войск. Толькі ў раёне Семежава частка паўстанцкіх атрадаў была разбіта і 7 снеж. адкінута да дэмаркацыйнай лініі (30 афіцэраў і 400 жаўнераў). Пасля вяртання сав. войск на дэмаркацыйную лінію паўстанцы зноў пачалі нападаць на атрады Чырв. Арміі. У ноч на 10 снеж. паўстанцы напалі на вёскі Крывасёлкі і Навасёлкі, 12 снеж. — на в. Старынь. 13 снеж. яны занялі Семежава, але пазней вымушаны былі з боем адысці. Штаб Слуцкай брыгады 15 снеж. пераехаў у в. Морач. У ноч на 18 снеж. паўстанцы зноў занялі Семежава, 19 снеж. — Вызну. Сав. камандаванне перакінула на фронт новыя сілы, якія ў выніку наступлення адбілі Вызну і Смолічы, 20 снеж. — Семежава. Штаб Слуцкай брыгады і атрады паўстанцаў перабазіраваліся ў в. Заастравечча (Клецкі р-н) каля р. Лань, за якой сталі польскія войскі. БРС прыняла рашэнне перайсці раку ў раёне размяшчэння 41-га польскага палка. 28.12.1920 Слуцкая брыгада перайшла за р. Лань, 31.12.1920 на польскі бок перайшоў апошні атрад паўстанцаў. Афіцэры і жаўнеры брыгады былі разброены і інтэрніраваны ў лагеры ў раёне в. Сіняўка (Клецкі р-н), потым пераведзены ў лагер у г. Беласток, а пазней — у лагер у Дарагуску. Вызвалены яны толькі ў маі 1921 пасля падпісання *Рыжскага мірнага дагавора 1921* і абмену ратыфікацыйнымі граматамі. Адзін батальён (каля 400 чал.) брыгады адмовіўся здацца польскім вайскоўцам і застаўся на Случчыне для працягу ваен. дзеянняў партыз. характару. У ’асн. гэта былі прыхільнікі Булак-Балаховіча. Яны вялі барацьбу яшчэ доўгі час. У абставінах, што склаліся ў канцы *грамадзян-*

скай вайны і ваеннай інтэрвенцыі 1918—22, С.п. шанцаў на перамогу не мела.

Літ.: Историко-стратегический очерк XVI армии. Могилев, 1921; А.К. Слуцкае паўстаньне: (З успамінаў удзельніка) // Бацькаўшчына. 1953. 7 студз.; Ю.Х. З успамінаў слуцкага паўстанца // Там жа. 1960. 27 лістап.; Змагар А. Вызвольныя шляхі. Кліўлянд, 1965. С. 41—44; Грыцкевіч А. Вакол «слуцкага паўстання». Мн., 1987; Яго ж. Слуцкае паўстаньне 1920 г. — збройны чын у барацьбе за незалежнасьць Беларусі // Спадчына. 1993. № 2; Лістапад Ю. Узьбіліся на свой шлях // Там жа. 1998. № 1; Найдзюк Я., Касяк І. Беларусь учора і сяньня. Мн., 1993; Круталевич В.А. Слуцкое восстание // Круталевич В.А. История Беларуси: Становление нац. державности (1917—1922 гг.). Мн., 1999; Слуцкі збройны чын 1920 г. ў дакумэнтах і ўспамінах. Мн., 2001; Łatyszonek O. Białoruskie formacje wojskowe, 1917—1923. Białystok, 1995. S. 195—208.

СЛУ́ЦКАЕ ПРАДПРЫЕ́МСТВА МАСТА́ЦКІХ ВЫ́РАБАЎ «СЛУ́ЦКІЯ ПАЯСЫ́». Створана ў 1960 як Слуцкая ф-ка маст. вырабаў на аснове арцелі «1 Мая» (засн. 1936) у г. Слуцк Мінскай вобл., з 2000 сучасная назва. Асн. прадукцыя: вырабы ручнога пераборнага ткацтва (сталовыя, чайныя, гасцінныя і інш. камплекты, посцілкі, накідкі на крэслы, канапы, паясы і інш.), строчавышытыя бялізнавыя вырабы, сувенірныя лялькі. Уклад у развіццё нар. маст. промыслаў зрабілі ткачыхі Г.Лешчанка, Т.Пацыкайлік, вядучы мастак А.Ісакова, вышывальшчыцы Г.Бадыль, М.Глобаж. Да пач. 1990-х г. працавалі ткацкія ўчасткі ў вёсках Чырвоная Дуброва, Семежава Капыльскага р-на, участак лозапляцення ў в. Вынісцы Слуцкага р-на.

СЛУ́ЦКАЕ ТКА́ЦТВА, бел. традыцыйнае ўзорыстае ткацтва на тэр. Слуцкага і суседніх Капыльскага (гл. *Капыльскае ткацтва*), Салігорскага, Любанскага р-наў Мінскай вобл. На яго аснове ў 18 ст. створана *Слуцкая мануфактура шаўковых паясоў*, дзейнасць якой садзейнічала пашырэнню ў рэгіёне новых ткацкіх тэхнік і прыёмаў. Ручнікі, абрусы, тканіны на адзенне ткалі ў тэхніках закладнога і бранага ткацтва. Арнаментальны малюнак чырвонага колеру ў выглядзе шырокіх шчыльных бардзюраў складаўся з буйных геам. матываў: ромбаў («шпоры»), паўромбаў («шурпы»), матываў у форме літары «Т» («малаты») і інш. З канца 19 ст. набыло пашырэнне шматнітавое ткацтва (да 16 нітоў); тканіны вызначаюцца бела-шэрай каларыстыкай і характэрным геам. малюнкам з разетак («у звёзды»), ромбаў («у бубны») і асабліва спалучэння квадратаў і прамавугольнікаў, што стварае мігатлівы кругападобны малюнак («у вакенцы», «у хвалі», «у кругі»). Пашырэнне ў 20 ст. тэхнікі адна- і двухбаковага пераборы ўзбагаціла геам. арнаментыку расл. і зааморфнымі матывамі. Ручнікі і абрусы вызначаюцца характэрным спалучэннем белага з блакітным, белага з зялёным і інш., посцілкі і дываны — яркім паліхромным малюнкам на чорным фоне. У 1920—50-я г. дзейнічалі ткацкія і вышывальныя арцелі, у 1960—80-я г. у многіх вёсках рэгіёна існавалі ткацкія ўчасткі ад *Слуцкага прадпрыемства мастацкіх вырабаў «Слуцкія паясы»*. Творы ручнога пераборнага і шматнітавога ткацтва (ручнікі, абрусы, сурвэты і інш.) захоўваюць традыц. бела-шэрую (з дадаткам чырвонага) каларыстыку.

Я.М.Сахута.



Плеценыя вырабы з лазы **Слуцкага прадпрыемства мастацкіх вырабаў «Слуцкія паясы»**.



Да арт. **Слуцкае ткацтва**. Ручнік. Вёска Барок Слуцкага раёна.

СЛУ́ЦКАЯ Вера Кліменцьеўна (сапр. Берта Браніславаўна; 17.9.1874, Мінск — 12.11.1917), удзельніца рэв. руху на Беларусі. З 1901 чл. Бунда, з 1902 чл. РСДРП(б). У 1898 зняволена, потым жыла ў Мінску пад наглядам паліцыі, у 1901 за рэв. агітацыю выслана ў мяст. Мір, у рэвалюцыю 1905—07 у Мінску. З 1909 у эміграцыі. З 1913 на парт. рабоце ў Пецярбургу. У 1917 чл. Петраградскага гар. к-та, сакратар Васільеваўстраўскага райкома РСДРП(б), чл. жаночага бюро ЦК РСДРП(б), чл. выканкома Петраградскага Савета. Загінула каля Царскага Сяла ў час наступлення войск Керанскага—Краснова на Петраград. Яе імем названа вуліца ў Мінску.

СЛУ́ЦКАЯ АКРУ́ГА, адм.-тэр. адзінка БССР у 1924—27 і 1935—38. Утворана 17.7.1924, пл. 8,4 тыс. км^2, нас. 273,1 тыс. чал. Цэнтр — г. *Слуцк*. Складалася з 7 раёнаў, 89 сельсаветаў, 1 горада (Слуцк), 5 мястэчак (Капыль, Любань, Старобін, Старыя Дарогі, Цімкавічы). Акр. газ. «Вясковы будаўнік». 12.4.1927 акруга скасавана, яе тэрыторыя перададзена Бабруйскай і Мінскай акр. 21.6.1935 утворана зноў (як памежная). Складалася з 6 раёнаў. Акр. газ. «Праўда на рубяжы». 20.2.1938 скасавана, тэрыторыя ўключана ў Мінскую вобл.

СЛУ́ЦКАЯ БАЛЕ́ТНАЯ ШКО́ЛА. Існавала ў 1756—60 пры *Слуцкім тэатры Радзівіла*. Засн. Г.Ф.Радзівілам для падрыхтоўкі артыстаў балетнай трупы. Да 1759 школай кіравалі А.Пуціні і Л.М.Дзюпрэ. У школе вучылі 8—10-гадовых дзяцей слуцкіх мяшчан, а таксама дзяцей негрыцянскіх нявольнікаў князя. Сярод вядучых артыстаў радзівілаўскіх т-раў навучэнцы Дыклер, Жукоўскі, А.Лойка, К.Міхневіч, Ражавіч. У пач. 1758 пастаўлены першы балет «На тры пары», у якім выхаванцы выявілі высокія здольнасці. Дакладна рэпертуар слуцкага балета невядомы, але ёсць падставы меркаваць, што пастаўлены «Балет з Арлекінам», «Венгерскі балет», «Турэцкі балет», а таксама балеты, у якія ўваходзілі нам., швейцарскія і шатландскія танцы («стралкоў», «садоўнікаў», «чарцей», «трубачыстаў», «кветачніц», «сялянак»). У 1760 школа пераведзена ў г. Нясвіж.

Літ.: Барышаў Г.І. Тэатры Радзівілаў у Нясвіжы і Слуцку // Гісторыя беларускага тэатра. Мн., 1983. Т. 1.

СЛУ́ЦКАЯ БЕЛАРУ́СКАЯ ГІМНА́ЗІЯ, Слуцкая народная агульная гімназія Хаўруса настаўнікаў, сярэдняя навучальная ўстанова ў 1917—20 у г. Слуцк Мінскай вобл. Утворана ў ліп. 1917 па ініцыятыве камісара Слуцкага пав. пры Часовым уладзе Р.К.Астроўскага (першы дырэктар). Утрымлівалася за кошт субсідый Слуцкага пав. земства і платы за навучанне, атрымлівала грашовыя дапамогі ад урада БНР (у 1918), Часовага Бел. нац. к-та ў Мінску (у 1920). У розны час у склад пед. рады ўваходзілі: М.Штэрнаў (дырэктар у 1919—20), П.Я.Жаўрыд, А.Істочнікава, Э.Людвіг, А.Макарава, С.К.Петрашкевіч, П.Сутрыс, М.Травін, М.Ярац і інш. Навуч. праграма гімназіі будавалася на ўзор б. рас. гімназій, дадаткова ўведзены бел. мова (абавязковы прадмет), гісторыя і геаграфія Беларусі (факультатыўныя), якія выкладаліся на бел. мове. Асн. кантынгент навучэнцаў — сял. дзеці з навакольных вёсак. Гімназісты з бедных сем'яў вызваляліся ад платы за навучанне. Пры гімназіі дзейнічала бел. маладзёжная арг-цыя «Папараць-кветка». У верасні 1920 гім-

назія пераўтворана ў сав. школу 2-й ступені. У гімназіі вучыліся С.Бусел, Л.Рыдлеўскі, М.Каберац, А.Яцэвіч (Змагар) і інш. *У.В.Ляхоўскі.*

СЛУ́ЦКАЯ БРЫГА́ДА, Слуцкая брыгада стральцоў, вайсковае пяхотнае злучэнне, якое створана ў ходзе *Слуцкага паўстання 1920* і падпарадкоўвалася ўраду *Беларускай Народнай Рэспублікі*. Арганізавана ў ліст. 1920 паводле пастановы 1-га бел. з'езда Случчыны (14—15.11.1920). Фарміравалася ў г. Слуцк і мяст. Семежава з бел. міліцыі Слуцка і Слуцкага пав. (створана ў пач. 1920), сялян-добраахвотнікаў і жыхароў Слуцка. У канцы ліст. 1920 брыгада налічвала 4 тыс. жаўнераў, разам з рэзервам — да 10 тыс. чал. Узбраенне С.б. ў снеж. 1920 — 2 тыс. вінтовак і 10 кулямётаў. Камандзірам брыгады *Беларуская рада Случчыны* (БРС) прызначыла капітана А.Анцыповіча. Асн. частку афіцэрскага саставу складалі бел. афіцэры — удзельнікі 1-й сусв. вайны. Былі арганізаваны штаб брыгады, аддзелы разведкі і контрразведкі, палявы шпіталь, вайсковы суд. Дзейнічала вайсковая школа для падрыхтоўкі камандзіраў. Брыгада складалася з 1-га Слуцкага і 2-га Грозаўскага палкоў са сваімі штабамі. Асобна меліся конны атрад, палкавыя абозы і зброевая майстэрня. У пач. паўстання палкі С.б. займалі фронт даўжынёй больш за 100 км на адлегласці 35—40 км на З ад Слуцка, на мяжы нейтральнай зоны. Баявыя дзеянні брыгада пачала 27 ліст. нападамі на размяшчэнне адзінак 8-й стралк. дывізіі Чырв. Арміі, а потым на інш. сав. часці. Падраздзяленні 16-й арміі, уведзеныя на тэр. нейтральнай зоны (са згоды польскага боку), 4—7.12.1920 пацяснілі часці С.б. Калі 3.12.1920 камандаванне брыгады было даручана штабс-капітану А.Сокал-Куцілоўскаму, брыгада актывізавала сваю дзейнасць і з баямі прасоўвалася на У да мястэчак Семежава і Вызна, якія неаднаразова пераходзілі з рук у рукі. Баі вяліся да 28.12.1920, пасля чаго БРС прыняла рашэнне пра адступленне С.б. на тэрыторыю, падкантрольную польскім войскам. Брыгада перайшла за р. Лань, дзе яе жаўнеры і афіцэры былі раззброены і інтэрніраваны.

Літ.: Гл. пры арт. *Слуцкае паўстанне 1920.* *А.П.Грыцкевіч.*

СЛУ́ЦКАЯ ГІМНА́ЗІЯ, Слуцкая кальвінісцкая гімназія, сярэдняя навуч. ўстанова ў г. Слуцк у 1617—1918. Засн. 20.5.1617 кн. Янушам Радзівілам пры кальвінісцкім зборы. Падпарадкоўвалася суперінтэнданту евангелічных цэркваў Навагрудскага пав. У 17 — сярэдзіне 18 ст. праграма нагадвала курс езуіцкіх *калегіумаў*, навуч. курс складаўся з 4 класаў з 2-гадовым тэрмінам кожны. Навучанне вялося на польскай мове (малодшыя класы) і на латыні (старэйшыя класы). Выкладаліся лац., стараж.-яўр., стараж.-грэч., ням. і польск. мовы, асновы логікі, рыторыкі, права, гісторыя, матэматыка, фізіка, музыка, гімнастыка, фехтаванне, спевы. Практыкаваліся дыспуты, ставіліся тэатр. пастаноўкі. Гімназія мела трывалыя сувязі з ун-тамі Гайдэльберга, Кёнігсберга, Берліна, Франкфурта-на-Одэры, Марбурга, Лейдэна, Эдынбурга і Оксфарда (туды пасылалі на вучобу лепшых выпускнікоў). Згодна са статутамі 1628 і 1679 у гімназію прымаліся дзеці ўсіх саслоўяў і веравызнанняў (практычна пераважалі дзеці пратэстанцкай шляхты). У выніку войнаў і палітыкі *контррэфармацыі* ў 2-й пал. 17 ст. гімназія прыйшла ў заняпад. У 1775 яна рэарганізавана ў адпаведнасці з патрабаваннямі *Адукацыйнай камісіі*. З 1778 С.г. — публічнае евангелічнае вучылішча, з 1809 — 4-класнае павятовае вучылішча ў сумесным падпарадкаванні Евангелічна-Рэфармацкага (кальвінісцкага) сінода і *Віленскай навучальнай акругі*, у 1828 пераўтворана ў 6-класную гімназію. Навучанне бясплатнае, кожны год прымалася 150 выхаванцаў. У 1840—56 выкладанне пераведзена на рус. мову. З-за абвінавачванняў ва ўдзеле ў паўстанні 1863—64 з 404 яго выхаванцаў 281 быў выключаны. У 1868 выведзена з-пад улады кальвінісцкай царквы і пераўтворана ў класічную 7-класную рус. гімназію ў ведамстве Віленскай навуч. акругі. У 1875 адкрыты 8-ы клас. У 1872 вучылася 228 чал., у 1880 — 325, у 1890 — 283, 1901 — 228, у 1915 — 461 вучань. Утрымлівалася на сродкі гар. казны, збораў за навучанне, працэнтаў з уласнага фундушу. Пед. калектыў уключаў дырэктара, інспектара, 17 выкладчыкаў, 3 памочнікаў класных настаўнікаў, урача і дантыста (пераважна выпускнікі ун-таў, духоўных акадэмій, Мінскай духоўнай семінарыі, настаўніцкіх семінарый Маладзечна, Нясвіжа, Свіслачы). З 1874 пры гімназіі дзейнічала метэаралагічная станцыя; пазней — фізічны, прыродазнаўчы і гіст.-геагр. кабінеты, б-ка. Сярод выхаванцаў гімназіі былі вядомыя дзеячы бел., рус. і польск. культуры: А.А.Аскерка, Я.Х.*Белабоцкі*, С.І.Богуш-Сестранцэвіч, З.Я.*Даленга-Хадакоўскі*, І.Ф.*Капіевіч*, медык А.Я.Красоўскі, астраном В.К.Цэраскі і інш.

Літ.: Сборник сведений о средних учебных заведениях Виленского учебного округа. Вильна, 1873; Глебов И. Историческая записка о Слуцкой гимназии с 1617—1630—1901 гг. Вильна, 1903; Нарысы гісторыі народнай асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі. Мн., 1968; Родченко Г.В. Старейшая школа Белоруссии // Педагогика и психология. Вып. 9. Вопросы истории и педагогики в БССР. Мн., 1976. *С.В.Казуля, А.Ф.Самусік.*

СЛУ́ЦКАЯ ДРУКА́РНЯ. Існавала ў 1672—1705 у г. Слуцк Мінскай вобл. Першая спроба стварыць яе зроблена ў 1665. Распачала дзейнасць на базе княжацкай друкарні Радзівілаў, што перавезена з Мітавы (цяпер г. Елгава, Латвія). У 1693 княгіня Людавіка Караліна Радзівіл перадала друкарню сіноду кальвінісцкай царквы ВКЛ, які перавёў яе ў час Паўн. вайны 1700—21 у г. Кёнігсберг (цяпер Калінінград, Расія). У С.д. друкаваліся на польскай мове рэліг. кнігі, ваен. і геагр. выданні, маст. творы, календары, навуч. дапаможнікі, мемуары, гравюры, пераклады з ням. і франц. моў. За перыяд 1673—87 выдадзены 23 кнігі тыражом 24 200 экз. Вядома 29 назваў кніг, у т.л. «Абшарнік, або Гаспадар ліфляндскі» І.Германа (1673), «Неабходныя заўвагі пра ваенны парадак» А.М.Фрэдры (1675), «Турэцкая манархія» П.Рыко ў пер. К.Клакоцкага (1678) з гравюрамі М.Вашчанкі, «Руская тэорыя» — падручнік па бел. мове. Тыражы кніг вагаліся ад 82—100 да 3389 экз. Выданні выкарыстоўваліся як падарункі, у Слуцку і Капылі іх прадаваў княжацкі гандляр Цэрнер.

Літ.: Грицкевич А.П. Книжное дело в феодальном Слуцке в XVI—XVIII вв. // Вопросы библиографоведения и библиотековедения. Мн., 1983. Вып. 4; Яго ж. Слуцк: Ист.-экон. очерк. 2 изд. Мн., 1970; Яго ж. Древний город на Случи. Мн., 1985; Шматаў В.Ф. Беларуская кніжная гравюра XVI—XVIII стст. Мн., 1984. *А.П.Грыцкевіч.*

СЛУ́ЦКАЯ КАНФЕДЭРА́ЦЫЯ 1767, саюз пратэстанцкай (кальвінісцкай і лютэранскай) і правасл. шляхты ВКЛ, арганізаваны для ўраўнавання яе ў паліт. правах з каталіцкай шляхтай. Фактычна арганізавана Рас. імперыяй для ўмяшання ва ўнутр. справы Рэчы Паспалітай. Абвешчана ў сак. 1767 у Слуцку, дзе была абрана яе рада з 33 чал. (амаль усе пратэстанты), у т.л. правасл. магілёўскі епіскап Георгій Каніскі, і маршалак — ген.-маёр Я.Грабоўскі (кальвініст). Акт С.к. падпісалі 248 чал. Канфедэрацыю ўзяла пад сваю «імператарскую пратэкцыю» Кацярына II. Канфедэраты разам з часцямі рас. арміі рушылі на Мінск, Вільню, Варшаву. Надзвычайны сойм у Варшаве ў 1767—68 зацвердзіў «вечны трактат» з Расіяй, абвясціў правасл. і пратэстанцкай шляхце роўныя правы з каталіцкай шляхтай. *А.П.Грыцкевіч.*

СЛУ́ЦКАЯ КАПЭ́ЛА РАДЗІВІ́ЛА, прыдворны аркестр князя Г.Ф.Радзівіла. Існавала ў 1746—60 у г. Слуцк Мінскай вобл. Іграла на балях, маскарадах, сямейных святах, паляваннях, з 1751 суправаджала паказы *Слуцкага тэатра Радзівіла*. Складалася пераважна з замежных музыкантаў. Капельмайстры А.Ваплер, Ф.Вітман, Т.Гартвіг; выканаўцы Т.Путс (басіст), Ю.Кагут (лютніст), Наверт і Гогенбрукнер (арфісты), Ф.Шперлінг і Ліст (трубачы), Горак (валтарніст), Паўтснер (арганіст), Гартвіг, Я.Мартэнс і інш. Капэла выступала ў рэзідэнцыях Радзівіла ў Слуцку і Белай (Бяла-Падляска, Польшча) і паза іх межамі. Сучаснікі адзначалі высокі прафес. ўзровень капэлы. Пасля смерці Радзівіла капельмайстры і некат. музыканты пераведзены ў Нясвіж, дзе працавалі ў *Нясвіжскай музычнай школе* і *Нясвіжскай капэле Радзівілаў*.

Літ.: Дадиомова О.В. Музыкальная культура городов Беларуси в XVIII в. Мн., 1992. С. 29; гл. таксама да арт. *Слуцкая музычная школа.* *В.У.Дадзіёмава.*

СЛУ́ЦКАЯ МАНУФАКТУ́РА ШАЎКО́ВЫХ ПАЯСО́Ў, Слуцкая персіярня. Дзейнічала ў 1740—1844 у г. Слуцк Мінскай вобл. У 1760-я г. да яе далучана Нясвіжская персіярня, што існавала з 1740-х г. у прыгарадзе Нясвіжа Альба. На мануфактуру быў запрошаны з г. Станіслава (цяпер Івана-Франкоўск, Украіна) майстар Я.Маджарскі (гл. ў арт. *Маджарскія*). Напачатку тут працавалі тур. майстры, потым падрыхтаваны бел. майстры ручнога шаўкаткацтва М.Баранцэвіч, І.Барсук, Я.Гадоўскі, Капчыла, Лойка, Т.Хаецкі і інш. У 1793 працавала 60 майстроў, было 28 станкоў. Вырабляліслуцкія паясы, а таксама шаўковыя пакрывалы і махры, залатыя і сярэбраныя галуны, падвязкі, стужкі, габелены, дываны. З пач. 19 ст. выпускала пераважна тканіны для літургічнага ўжытку.

Літ.: Карпачоў Я.М. Узнікненне і развіццё Слуцкай вотчыннай мануфактуры шаўковых паясоў // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. 1982. № 3. *Дз.С.Трызна.*

СЛУ́ЦКАЯ МІХА́ЙЛАЎСКАЯ ЦАРКВА́, помнік драўлянага дойлідства 18—19 ст. у г. Слуцк Мінскай вобл. Пабудавана ў традыцыях нар. дойлідства з элементамі стыляў барока і позняга класіцызму. Напачатку існавала як Канстанцінаўская царква ў Старым горадзе, у канцы 18 ст. перанесена ў прадмесце Востраў і пабудавана на месцы разабранай у 1795 Міхайлаўскай царквы. У 1812 разрабавана франц. войскамі. Першапачаткова храм 2-зрубны, складаўся з асн. аб'ёму і апсіды, у канцы 19 ст. з захаду да асн. аб'ёму прыбудавана вежа-званіца. Царква яруснай кампазіцыі. Асн. прамавугольны ў плане 3-светлавы аб'ём і апсіда апяразаны па перыметры 2 глухімі прамавугольнымі ў плане галерэямі. Асн. аб'ём завершаны васьмерыком на чацверыку на заломах і ветразях, над апсідай — чацверыковы верх. Над вярхамі складанай формы купалы з цыбулепадобнымі купалкамі на глухіх васьмерыках. 3-ярусная вежа-званіца завершана шлемападобным купалам са шпілем. З 1990-х г. сабор.



Слуцкая Міхайлаўская царква.

Ю.А.Якімовіч.

СЛУ́ЦКАЯ МУЗЫ́ЧНАЯ ШКО́ЛА. Існавала ў 1746—60 у г. Слуцк Мінскай вобл. (паводле ўскосных звестак). Рыхтавала музыкантаў для *Слуцкай капэлы Радзівіла*. Сярод навучэнцаў — гар. і вясковыя жыхары, сярод выкладчыкаў — Ф.Вітман, «прыдворны капельмайстар для навучання прыгонных капелістаў» (кантракт 1756), магчыма, і інш. выканаўцы капэлы.

Літ.: Грицкевич А.П. Древний город на Случи. Мн., 1985. С. 120; Miller A. Teatr Polski i muzyka na Litwie... Wilno, 1936. S. 38. *В.У.Дадзіёмава.*

СЛУ́ЦКІ Барыс Абрамавіч (7.5.1919, г. Славянск Данецкай вобл., Украіна — 22.2.1986), рускі паэт. Скончыў Літ. ін-т імя М.Горкага ў Маскве (1941). Друкаваўся з 1941. Першая паэт. кніга — «Памяць» (1957). У зб-ках вершаў «Час» (1959), «Сёння і ўчора» (1961), «Сучасныя гісторыі» (1969), «Дабрыня дня» (1973), «Няскончаныя спрэчкі» (1978), «Тэрміны» (1984), «Пытанні да сябе» (апубл. 1988) і інш. тэмы Вял. Айч. вайны, паўсядзённага жыцця. Вершы С. адметныя грамадзянскасцю, размоўнай інтанацыяй, дэманстратыўнай празаічнасцю мовы, шчырасцю. Аўтар перакладаў з польскай мовы, літ.-крытычных артыкулаў і рэцэнзій. Асобныя вершы С. на бел. мову пераклаў Н.Гілевіч.

Тв.: Собр. соч. Т. 1—3. М., 1991; Избранное, 1944—1977. М., 1980; Стихи разных лет: Из неизданного. М., 1988; Я историю излагаю... М., 1990.

СЛУ́ЦКІ ЕЗУІ́ЦКІ КАЛЕ́ГІУМ, установа ордэна езуітаў у Слуцку ў 1689—1773. У 1689—1704 місія, у 1704—15 рэзідэнцыя, у 1715—73 калегіум. У 1692 віцебскі падчашы Ян Слонскі і яго жонка Кацярына адпісалі езуітам двор у Слуцку і 2 вёскі. Першыя драўляныя будынкі місіі і рэзідэнцыі месціліся ў гар. раёне Падвалле. У 1715 у раёне Зарэчча пабудаваны драўляныя корпус калегіума і касцёл св. Тройцы — 8-граны ў плане храм з купалам у цэнтры і 4 вежамі па вуглах; стары корпус рэзідэнцыі ў Падваллі перароблены ў канвікт (інтэрнат). У 1698 тут адкрыта школа граматыкі, у 1702 — паэтыкі, у 1704 — рыторыкі. Пры калегіуме існавалі муз. бурса (з 1713) і аптэка (з 1762). У б-цы меліся каштоўныя старадрукі і рукапісы, пасля скасавання калегіума з яго б-кі 2200 тамоў перададзены ў б-ку Віленскага ун-та. У 1773 калегіум скасаваны. У 1804 касцёл і ўсе пабудовы калегіума знішчаны пажарам.

СЛУ́ЦКІ ІЛЬІ́НСКІ МАНАСТЫ́Р, праваслаўны манастыр у г. Слуцк Мінскай вобл. ў 16—19 ст. Размяшчаўся ў Старым горадзе на вул. Віленскай перад Віленскай брамай. Дакладная дата заснавання невядома. Упершыню згадваецца ў 1515. Царк. гісторыкі лічаць, што да 1611 манастыр быў мужчынскі, потым пераўтвораны ў жаночы. У 19 ст. манастырскі комплекс уключаў халодную саборную царкву Уваходу Ісуса Хрыста ў Іерусалім, цёплую царкву св. Іаана Златавуста, званіцу над гал. уязной брамай, манастырскі корпус з 13 келлямі, дамок для ігуменні, гасп. пабудовы. Усе будынкі былі драўляныя. Паводле рашэння сінода ў 1854 манастыр закрыты, а яго маёмасць перададзена Пінскаму Варварынскаму манастыру. У 1856 будынак цёплай царквы перанесены на Замкавую гару ў Слуцку, а Саборная царква ў 1861 перавезена ў в. Заўшыцы Слуцкага пав. (абедзве не захаваліся), дамок ігуменні і манастырскі жылы корпус перададзены гар. сабору.

Н.І.Пятровіч.

СЛУ́ЦКІ КАНСЕ́РВАВЫ ЗАВО́Д. Засн. ў 1930 у г. Слуцк як плодаагароднінны з-д. З 1933 плодавінзавод. У Вял. Айч. вайну разбураны. Адноўлены ў 1945. У 1953—64 — сокавы з-д. У 1959—63 рэканструяваны і расшыраны: пабудаваны кансервавы цэх, халадзільнік, агароднінасховішча. З 1964 кансервавы з-д. У 1965 далучаны Покрашаўскі воцатны з-д, у 1972 — Слуцкі сокавы з-д, у 1976 — Старадарожскі райхарчкамбінат. Пазней Покрашаўскае і Старадарожскае прадпрыемствы адышлі ад С.к.з. У 1990-х г. пабудаваны 2 склады для сыравіны і тары. Асн. прадукцыя (2002): агароднінныя і фруктовыя кансервы, віно, гарчыца, кандытарскія вырабы.

СЛУ́ЦКІ КАСЦЁЛ І КЛЯ́ШТАР БЕРНАРДЗІ́НЦАЎ, помнік архітэктуры позняга барока ў г. Слуцк Мінскай вобл. Пабудаваны ў 1793 з цэглы на месцы б. драўляных будынкаў (пастаўлены ў 1671, рэканструяваны ў 1734). Касцёл — 1-нефавы прамавугольны ў плане бязвежавы храм, накрыты 2-схільным дахам (не захаваўся). Гал. фасад сім. па кампазіцыі, завершаны фігурным франтонам з валютамі, сцены раскрапаваны пілястрамі, якія чаргуюцца з лучковымі аконнымі праёмамі. Да касцёла прыбудаваны 1-павярховы П-падобны ў плане будынак кляштара, накрыты вальмавым дахам. Вуглы будынка апрацаваны лапаткамі. *В.Р.Кукуня.*

СЛУ́ЦКІ КРАЯЗНА́ЎЧЫ МУЗЕ́Й. Засн. ў кастр. 1952 у г. *Слуцк*. Пл. экспазіцыі 280 м², 5 залаў, б-ка, 22,5 тыс. адзінак асн. фонду (2002). Сярод экспанатаў страж. прылады працы, жан. ўпрыгожанні з гарадзішча *Івань*, касцяныя і драўляныя шахматныя фігуры, каменныя і бурштынавыя крыжыкі 12 ст., керамічны посуд, скураны абутак з гарадзішча страж. Слуцка, кафля 17 ст. з выявай герба Слуцка, фрагменты *слуцкіх паясоў*, вырабы з урэцкага шкла, габелены «Паляванне на дзіка» (18 ст.), «На водную прагулку» (19 ст.), старадрукі 18 ст., дакументы і матэрыялы пра вайну 1812, паўстанне 1863—64, рэв. рух 19 — пач. 20 ст., *Слуцкае паўстанне*

1920, падзеі часоў грамадз. вайны, партыз. рух і падполле ў Вял. Айч. вайну, слуцкі лагер смерці. У калекцыях музея творы бел. прафесійных і самадзейных мясц. мастакоў, вырабы мясц. майстроў ткацтва, вышыўкі, лозапляцення, разьбы па дрэве, рогу і інш. Музей выпускае брашуры і буклеты па гісторыі Случчыны, пра помнікі архітэктуры, слуцкія паясы і інш. З 2001 працуе філіял «Побыт сялян. 19 — пач. 20 ст.».

В.С.Відлога.

СЛУ́ЦКІ ЛЕ́ТАПІС, Уараўскі летапіс, помнік беларуска-літоўскага летапісання 16 ст., адзіны спіс 3-й, скарочанай рэдакцыі *Беларуска-літоўскага летапісу 1446*. Збярогся ў рукапісе 1-й чвэрці 16 ст. Як сведчаць запісы на палях, што датычаць князёў слуцкіх, бытаваў і, напэўна, узнік у Слуцку (адсюль назва). У адрозненне ад 2-й рэдакцыі Бел.-літ. летапісу 1446 (гл. *Нікіфараўскі летапіс, Супрасльскі летапіс, Акадэмічны летапіс*), у якой спачатку змешчана летапісная кампіляцыя з рус. летапісаў, а ў канцы — мясцовыя гіст.-літ. творы, С.л. адкрываецца *«Летапісцам вялікіх князёў літоўскіх»*, завяршаецца агульнарус. летапісам. Апошні дадаткова скарочаны і змяшчае выбарачныя гіст. запісы пра падзеі 970—1240 (абрываецца на апісанні паходу Батыя на Кіеў і Галіцка-Валынскую Русь). Іншы парадак размяшчэння ў гэтым спісе *«Пахвалы Вітаўту»* і *Смаленскай хронікі*. Рукапіс дэфектны, без пачатку і канца, не хапае лістоў у сярэдзіне. Да 1917 зберагаўся ў б-цы графа А.С.Уварава (адсюль другая назва) у Маскве, цяпер — у Гіст. музеі ў Маскве. Асн. арыгінальная частка С.л. ўпершыню апубл. ў 1854 А.М.Паповым, у 1877 выдадзены ў Кёнігсбергу ў перакладзе на ням. мову. Поўнасцю змешчаны ў 17-м і 35-м т. *«Поўнага збору рускіх летапісаў»*.

В.А.Чамярыцкі.

СЛУ́ЦКІ МЯСАКАМБІНА́Т. Буд-ва пачата ў 1973 у г. Слуцк. Здадзены ў эксплуатацыю: 1-я чарга ў 1976, 2-я і 3-я ў 1977, пякарня ў 1996, кансервавы цэх у 1999, свінагадоўчы комплекс у 2000. З 1995 адкрытае акц. т-ва. Фірменныя магазіны ў Слуцку (2) і Жыткавічах. Асн. прадукцыя (2002): мяса, каўбасныя вырабы, харч. тлушч, субпрадукты, сухія кармы, мясныя кансервы, паўфабрыкаты, скуры, эндакрынаферментная сыравіна, натуральная каўбасная абалонка, хлебабулачныя вырабы.

СЛУ́ЦКІ ПАВЕ́Т, адм.-тэр. адзінка на Беларусі ў 1795—1924. Утвораны 3.5.1795 у складзе Мінскай губ. Рас. імперыі. Цэнтр — г. *Слуцк*. З 1796 пл. павета каля 6,5 (паводле інш. звестак 6,8) тыс. кв. вёрст, з якіх 97% належала прыватным уласнікам. У канцы 1796 да С.п. далучана тэр. скасаванага Нясвіжскага пав. У 1866 утворана 23 воласці: Быстрыцкая, Вызненская, Гавязнянская, Грозаўская, Грыцэвіцкая, Грэская, Заастравецкая, Кіявіцкая, Клецкая, Круговіцкая, Ланская, Ляхавіцкая, Мядзведзіцкая (Мядзведзіцкая), Пагосцкая, Пацейкаўская, Раманаўская, Сіняўская, Слуцкая, Старобінская, Цараўская, Цімкавіцкая, Цялядавіцкая, Чапліцкая. У 1867 у павеце 142,1 тыс. чал. (без Слуцка), 928 нас. пунктаў, у т.л. 2 гарады (Слуцк, заштатны Нясвіж), 11 мястэчкаў, 43 сялы, 5 слабод, 403 вёскі, 464 фальваркі. У 1890 далучана Пукаўская вол. Ігуменскага пав. У 1897 — 260,4 тыс. чал., з іх 190,9 тыс. праваслаўных, 40,9 тыс. іудзеяў, 27,5 тыс. католікаў. З 1909 Ляхавіцкая і Мядзведзіцкая вол. знаходзіліся ў Навагрудскім пав. 31.1.1919 павет у складзе БССР, Літ.-Бел. ССР, з чэрв. 1920 зноў у БССР. У 1920 Гавязненская, Грыцэвіцкая, Клецкая, Ланская, Пацейкаўская, Сіняўская, Цімкавіцкая, Цялядавіцкая вол. перададзены ў Нясвіжскі пав., Заастравецкая і Круговіцкая вол. заняты польск. войскамі і з сак. 1921 у складзе Польшчы. У маі 1922 да павета далучана Любанская вол. Бабруйскага пав. 17.7.1924 павет скасаваны, яго тэрыторыя ўвайшла ў *Слуцкую акругу*.

В.Л.Насевіч.

СЛУ́ЦКІ РАЁН. Размешчаны на Пд Мінскай вобл. Утвораны 17.7.1924 (у сучасных межах з 25.12.1962). Пл. 1,8 тыс. км². Нас. 40,5 тыс. чал. (2001, без г. Слуцк). Сярэдняя шчыльн. 23 чал. на 1 км². Цэнтр — г. *Слуцк*. Уключае 209



Аўтар В.Л.Насевіч



сельскіх нас. пунктаў, 19 сельсаветаў: Акцябрскі, Амговіцкі, Беліцкі, Бокшыцкі, Вясейскі, Гацукоўскі, Грэскі, Знаменскі, Ісернскі, Казловіцкі, Кіраўскі, Ленінскі, Маяцкі, Паўстынскі, Першамайскі, Покрашаўскі, Рачкавіцкі, Сорагскі, Сяражскі.

Большая ч. тэрыторыі ў межах *Цэнтральна-бярэзінскай раўніны*, паўн.-зах. — у межах *Капыльскай грады*. Паверхня пераважна раўнінная, 80% яе на выш. 160—180 м, 18% — на выш. 150—160 м. Найвыш. пункт 212 м на Пн ад в. Жылін Брод. Агульны нахіл з Пн на Пд. Карысныя выкапні: торф, мел, калійныя солі (паўн. ч. *Старобінскага радовішча калійных і каменнай солей*), буд. пяскі, пясчанажвіровы матэрыял, гліны і суглінкі для цэглы. Сярэдняя т-ра студз. -6,3 °С, ліп. 18 °С. Ападкаў 580 мм за год. Вегетац. перыяд 193 сут. Найб. р. Случ з прытокамі Лакнея, Морач, Сівельга, Вясейка, Вял. Сліва. Вадасх. Рудня. Пераважаюць глебы с.-г. угоддзяў: дзярнова-падзолістыя забалочаныя (34,2%), дзярнова-падзолістыя (29,8%), дзярновыя забалочаныя (14,7%), тарфяна-балотныя (13,6%). Пад лесам 23,6% тэрыторыі, найб. лясныя масівы на Пн і ПнУ. Пераважаюць лясы хваёвыя, бярозавыя, яловыя, чорнаальховыя, трапляюцца асінавыя, дубовыя, грабавыя і інш. Штучныя насаджэнні — каля 19%, пераважна хваёвыя. Пад балотамі 0,9% тэр. раёна, найб. Пшіч, Верхслуч, Жукава, Чамярыца, Вял. Мох—Ямнае. У межах раёна помнік прыроды рэсп. значэння — насаджэнне лістоўніцы ва Урэцкім лясніцтве.

Агульная пл. с.-г. угоддзяў 105,5 тыс. га, з іх асушаных 53,2 тыс. га. На 1.1.2002 у раёне 27 калгасаў, 1 саўгас, 19 фермерскіх гаспадарак, падсобная гаспадарка адкрытага акц. т-ва (ААТ) «Сельгасхімія», с.-г. прадпрыемствы ААТ «Крывая Града», «Эксперыментальная база «Танежыцы», даччынае Бел. чыгункі саўгас «Рачкавічы», арэнднае «Колас», с.-г. вытв. кааператыў «Селішча», племптушказавод. Сельская гаспадарка спецыялізуецца на малочна-мясной жывёлагадоўлі, свінагадоўлі, птушкагадоўлі, вырошчванні збожжавых і зернебабовых культур, кукурузы, цукр. буракоў, шматгадовых сеяных траў, лёну, бульбы. Прадпрыемствы прам-сці: харч. (сыр, вінна-гарэлачныя вырабы, воцат харчовы), буд. матэрыялаў (бетон, жалезабетонныя канструкцыі, пенапалістырол, палістыролбетон), паліўнай (торфабрыкет), металаапр. (вогнетушыцелі, садова-агародны інвентар); лясгас (драўніна, піламатэрыялы). Па тэр. раёна праходзяць чыгункі Баранавічы — Асіповічы і Слуцк — Салігорск; аўтадарогі Мінск — Мікашэвічы, Асіповічы — Баранавічы, Івацэвічы — Старыя Дарогі і інш. У раёне 24 сярэднія, 9 базавых, 3 пач., 4 муз. школы, 3 школы мастацтваў, ПТВ, 26 дашкольных устаноў, 26 дамоў культуры, 12 клубаў, 40 б-к, 9 бальніц, 3 паліклінікі, 6 амбулаторый, 35 фельч.-ак. пунктаў, 2 дзіцячыя санаторыі «Случ» і «Сонейка». Помнікі архітэктуры: касцёл (пач. 20 ст.) у в. Балотчыцы, Сямёнаўская царква (канец 19 — пач. 20 ст.) у в. Барок, касцёл езуітаў (1649) у в. Замосце, паштовая станцыя (сярэдзіна 19 ст.) у в.

Чырвонае Сяло. Выдаецца газ. «Слуцкі край». *Г.С.Смалякоў, В.Б.Шагімуратаў.*

СЛУ́ЦКІ СТРОЙ, традыцыйны комплекс бел. нар. адзення цэнтр. Беларусі. Бытаваў у канцы 19 — пач. 20 ст. на



Слуцкі строй. Маладуха ў традыцыйным адзенні. Случчына. Пач. 20 ст.

тэрыторыі, што ўключала г. Слуцк (пераважна мяшчан) і навакольныя вёскі. Яму ўласцівы аднатыпнасць форм адзення, сціпласць арнаментальнага аздаблення, перавага крамных тканін.



Слуцкі строй. Дзяўчаткі ў святочным убранні. Случчына. Пач. 20 ст.

Летні жаночы гарнітур складалі кашуля, спадніца, фартух і гарсэт. Кашулю шылі з каўняром (пры нашэнні прыпадымалі вакол шыі), з рукавамі, сабранымі на каўнерцы. Спадніцу шылі з крамнай шарсцянкі або з даматканай клятчастай тканіны светлых вясёлкавых колераў, фартух — з крамнага цёмнага ці белага набіванага паркалю з нашыўкамі шырокіх паскаў карункаў па нізе. Доўгі сцэльны гарсэт цёмна-сіняга ці чорнага колеру з аблямоўкай па крыссі меў вялікі, амаль да таліі, выраз, які запаўняўся вертыкальным шляком вышыўкі кашулі і шматлікімі нізкамі пацерак. Галаўныя ўборы жанчын — вялікія з махрамі набіваныя хусткі, завязаныя ў выглядзе цюрбана. У мужчынскі гарнітур уваходзіла кашуля з адкладным каўняром, ільняныя або суконныя нагавіцы, у якія запраўлялася кашуля, камізэлька. Галаўныя ўборы мужчын — саламяныя капелюшы з расшыраным верхам, футраванкі, картузы. Верхняе адзенне мужчын і жанчын значна адрознівалася: жаночую вопратку кроілі па тыпу гарсэта, да якога прыточвалі рукавы (чорныя суконныя курцікі, світы), а мужчыны насілі курты з чорнага ці карычневага сукна, кажухі.

М.Ф.Раманюк.

СЛУ́ЦКІ ТРО́ІЦКІ МАНАСТЫ́Р. Існаваў у 15 ст. — 1950-х г. у г. Слуцк Мінскай вобл. як правасл. мужчынскі. Размяшчаўся на левым беразе р. Случ у прадмесці Трайчаны, таму вядомы і пад назвай Трайчанскі. Час узнікнення невядомы, упершыню згадваецца ў 1455. Манастыр меў 2 царквы, жылыя будынкі і гасп. пабудовы. У гіст. л-ры прынята лічыць, што гал. храм манастыра — Троіцкая царква — пабудаваны ў 1505. Вядома, што ў 1654 царква была мураваная. У 1654—67 і ў 18 ст. манастыр моцна пацярпеў, царква амаль цалкам знішчана. У 1785—88 царква адбудавана паводле праекта і пад кіраўніцтвам арх. Ш.В.Турава ў стылі барока. Крыжова-купальны ў плане храм з дзвюма 3-яруснымі чацверыковымі вежамі-званіцамі на гал. фасадзе, на паўн. вежы быў гадзіннік. Тарцовыя сцены крылаў трансепта завершаны фігурнымі франтонамі. Над сяродкрыжжам узвышаўся аб'ём з вял. купалам на чацверыку, над ім — бельведэр, увянчаны маленькім купалам на светлавым барабане. У царкве захоўваліся цудатворны абраз Маці Божай і абраз Казанскай Маці Божай візант. пісьма, Евангелле 1582, пісанае слуцкім кн. Юрыем Юр'евічам Алелькавічам, стараж. партрэты князёў Алелькавічаў, вырабы з серабра і інш. Комплекс таксама ўключаў жылыя памяшканні: дом архімандрыта, дом для гасцей, трапезную, мураваны «скабец» са склепам, гасп. пабудовы— адрыну, стайні, бровар, калодзеж з компасам (на драўляных слупах) і інш. У 1867 узведзены мураваны манастырскі корпус з цёплай царквой св. Іаана Багаслова, у 1868 — мураваная брама, каля якой мясцілася яшчэ адна цёплая царква — Дабравешчанская. Пры манастыры дзейнічала школа граматы і рамёстваў. У 1785—1840 на тэр. комплексу размяшчалася духоўная семінарыя (з 1793 наз. Мінская духоўная семінарыя). Дакладны час закрыцця манастыра невядомы, усе будынкі разбураны.

Літ.: Русские монастыри. М., 1995.

В.Р.Кукуня, Н.І.Пятровіч.



Слуцкі Троіцкі манастыр. Агульны выгляд Троіцкай царквы. З малюнка Н.Орды. 19 ст.

СЛУ́ЦКІ ТЭА́ТР РАДЗІВІ́ЛА, прыдворная тэатр. трупа кн. Г.Ф.Радзівіла ў г. Слуцк Мінскай вобл. ў 1751—60. У т-ры ставіліся оперы (на італьян. і ням. мовах), балеты і драм. спектаклі. Балетная трупа падрыхтавана ў *Слуцкай балетнай школе*. Спектаклі суправаджала капэла музыкантаў высокай кваліфікацыі (пераважна немцы, чэхі, аўстрыйцы). У драм. спектаклях прымалі ўдзел таксама кадэты, педагогі і музыканты кадэцкага корпуса (у 1752 капельмайстар Ф.Вітман выступіў у ролі «багацея», у 1753 «шпрахмістар» Вебер — у ролі Візіра), прафес. акцёры (Мараўскі, Ажэльскі) і інш. Рэгулярнай з'явай былі пастаноўкі «нямецкіх» камедый. У масавых сцэнах удзельнічалі салдаты гарнізона (у парадная форме, са зброяй яны служылі «ўпрыгожаннем» залы, стоячы навыцяжку каля ложаў у час спектакляў). Спецыяльна для т-ра былі напісаны драмы на ням. мове, сцэнарый якіх прадугледжваў выхад на сцэну групы салдат (штурм крэпасцей, фехтаванне, баталіі, сцэны пакарання смерцю і інш.). Адбываліся паказы т-ра ценяў і марыянетак, якія спалучаліся з паказамі камедый дэль артэ і «турэцкіх камедый».

Драўляны будынак т-ра (паводле інвентара 1765) размяшчаўся на тэр. Старога горада. На гал. яго фасадзе мелася галерэя з размаляванай балюстрадай. Сцены глядзельнай залы былі аздоблены люстэркамі, лавы партэра, абапал якога размяшчаліся ложы, абцягнутыя чырвоным і блакітным сукном, столь была ababітая палатном і размаляваная. Асвятлялі залу 9 шкляных люстраў. Ад партала ўглыб сцэны (паралельна рампе) было замацавана (на рухомых рамах) 36 намаляваных на палатне кулісных перасоўных дэкарацый. У закулісняй частцы меліся 2 артыстычныя пакоі. З боку вуліцы т-р фланкіравалі 2 жылыя флігелі для акцёраў. Будынкі т-раў не зберагліся.

Літ.: Б а р ы ш а ў Г.І. Тэатры Радзівілаў у Нясвіжы і Слуцку // Гісторыя беларускага тэ-

атра. Мн., 1983. Т. 1; Я г о ж. Театральная культура Белоруссии XVIII в. Мн., 1992.

СЛУ́ЦКІ ЦУКРО́ВА-РАФІНА́ДНЫ КАМБІНА́Т. Дзейнічае з 1965 у г. Слуцк Мінскай вобл. як цукрова-рафінадны з-д (поўнасцю пушчаны ў 1970), з 1976 — камбінат. З 1993 расшыраецца і перааснашчаецца да магутнасці 6 тыс. т перапрацоўкі цукр. буракоў (раней магутнасць была 3 тыс. т). З 1996 адкрытае акц. т-ва. Асн. прадукцыя (2002): цукар-пясок з цукр. буракоў і імпартаванага цукру-сырцу ў мяшках і фасаваны. Адходы (патака-мелес і жамерына) ідуць на прадпрыемствы па вырабе дражджэй, спірту, лімоннай кіслаты, на корм жывёле.

СЛУ́ЦКІС (Sluckis) Мікалас (н. 20.10.1928, г. Паневяжыс, Літва), літоўскі пісьменнік. Засл. дз. мастацтваў Літвы (1978). Нар. пісьменнік Літвы (1984). Скончыў Вільнюскі ун-т (1951). Друкуецца з 1945. Раннія апавяданні ў зб-ках «Я зноў бачу сцяг» (1948), «На ветры» (1958), «Няхай мы лепш не сустрэнемся» (1961), «Усмешкі і лёсы» (1964), «Крокі» (1965, Дзярж. прэмія Літвы 1966) адметныя лірычнасцю, дакладнасцю псіхал. аналізу. Раман «Лесвіца ў неба» (1963, экранізаваны ў 1967) пра складаныя драм. падзеі пасляваен. Літвы. У раманах «Адамаў яблык» (1966), «Смага» (1968), «На выходзе дня» (1976, тэлефільм 1985), «Паездка ў горы і назад» (1981), «Дрэва свету» (1985), зб. аповесцей і апавяд. «Вяртанне прыгажуні» (1998) і інш. жыццё сучаснай інтэлігенцыі, маральныя і псіхал. канфлікты, праблемы адчужэння бацькоў і дзяцей і інш. Для яго прозы характэрна выкарыстанне ўнутр. маналога, шматпланавасць, метафарычнасць. Аўтар п'ес, у т.л. «Ці не шалёны твой сабака» (паст. 1974), казак і казачных аповесцей, крытычных артыкулаў. На бел. мову асобныя апавяданні С. перакладалі А.Асташонак, В.Грыгалюнас, Я.Каршукоў, А.Кудравец.

Тв.: Бел. пер. — Буслы. Мн., 1955; Рус. пер. — Избр. произв. Т. 1—2. М., 1980.

Літ.: Т е р а к о п я н Л. Миколас Слуцкис. М., 1976. *А.П.Лапінскене.*

СЛУ́ЦКІЯ, княжацкі род у ВКЛ, гл. *Алелькавічы.*

СЛУ́ЦКІЯ ГАРАДСКІ́Я ЎМАЦАВА́ННІ, комплекс драўляна-земляных умацаванняў г. *Слуцк* у 11—18 ст. Самыя раннія ўмацаванні адносяцца да часу заснавання горада, які ўзнік у 11 ст. на гарадзішчы ранняга жал. веку ў сутоках рэк Бычок і Случ. Уяўлялі сабой глініста-пясчаны вал вышынёй каля 6 м, шырынёй 20—22 м у аснове. Па версе насыпу ішоў вастракол вышынёй 4—6 м з дубовых бярвён таўшчынёй 14—16 см, верхні край якога быў завостраны на гранёны конус. Вал ахопліваў усю пляцоўку дзядзінца летапіснага Случаска. За валам каля падэшвы гарадзішча быў выкапаны роў глыбінёй каля 2 м, шырынёй 25 м, які запаўняўся вадой з р. Бычок. Верагодна, у 12—13 ст. існавалі драўляна-земляныя ўмацаванні абапал вакольнага горада, што размяшчаўся на ПнУ ад дзядзінца (іх рэшткі зруйнаваны ў 1960-я г. ў час будаўніцтва).

У 1409 на месцы дзядзінца і вакольнага горада ўзніклі Верхні і Ніжні замкі (гл. ў арт. *Слуцкія замкі*). Відаць, да 16 ст. Слуцк меў драўляна-земляныя ўмацаванні, знешні выгляд якіх сфарміраваўся яшчэ ў стараж.-рус. час і якія надзейна ахоўвалі яго ад нападаў крымскіх татар у 1502, 1503, 1505, 1506 і войск Міхаіла Глінскага ў 1508 у час вайны Маск. дзяржавы з ВКЛ 1507—08. Паводле пісьмовых крыніц, у 1509 пачалося буд-ва ўмацаванняў вакол усяго гар. паселішча, што прымыкала да замкаў. Паводле Хронікі Быхаўца, у пач. 16 ст. гэтыя ўмацаванні ахоплівалі Стары горад з замкамі на правым беразе р. Случ і Новы горад (Зарэчча), які размясціўся на яе левым беразе. Як сведчыў маск. дзяк Трыфан Карабейнікаў, які ў 1539 з дыпламат. місіяй наведаў ВКЛ, Слуцк меў драўляна-земляныя ўмацаванні і тым не менш быў «... горада Менска больши и лутчи...». На рубяжы 16—17 ст., калі на бел. землях пачалі пашырацца земляныя ўмацаванні старагаландскага тыпу, Слуцк быў абведзены магутным валам і вадзяным ровам. Непрыступнасць С.г.у. выявілася ў 1655 у час вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—67, калі 20-тысячнае войска рус. кн. А.М.Трубяцкога 2—6 вер. беспаспяхова вяло аблогу горада. З 27 да 30 вер. войска Трубяцкога, да якога далучылася яшчэ 5 тыс. казакоў І.Залатарэнкі, паўтарыла аблогу і зноў няўдала. Увесь Слуцк, за выключэннем Астроўскага і Трайчанскага прадмесцяў, быў абнесены ўмацаваннямі. Абарончая лінія Старога горада мела выгляд магутнага земляного вала, які дугой апяразваў старую частку горада з У, Пн, З і ўпіраўся сваімі канцамі ў р. Случ. Тут было 12 бастыёнаў рознай канфігурацыі і памераў. Перад земляным валам знаходзіўся роў. Трапіць у Слуцк можна было праз 3 брамы — Астроўскую, Ільінскую (пазней Віленскую) і Капыльскую. Паводле гіст. крыніц, гар. вал дасягаў шырыні не менш як 26,6 м і вышыні каля 8 м. Капыльская і Ільінская брамы мелі аднолькавыя памеры ў аснове — 25,6 × 36,6 м, Астроўская — 9,15 × 15,25 м. Цераз вадзяны роў былі перакінуты пад'ёмныя масты. Кварталы Новага места абкружалі вал і роў, якія сваімі канцамі сыходзіліся да р. Случ. Тут мелася 7 бастыёнаў і ўязная драўляная брама — Навамеская. Агульная даўжыня С.г.у. у канцы 18 ст. дасягала амаль 3840 м. На працягу 18 ст. Слуцк заставаўся магутным умацаваннем. У 1780 рас. афіцэры, якія складалі тапагр. апісанне горада, адзначалі непашкоджаны стан яго ўмацаванняў, у т.л. 4 брам. Канчаткова рэшткі С.г.у. бастыённага тыпу знішчаны ў выніку будаўнічых работ у жн. 1986.

Літ.: Т к а ч о ў М.А. Замкі і людзі. Мн., 1991; К а л я д з і н с к і Л.У. Умацаванні і ўзбраенне дзядзінца летапіснага Случаска (XII—XIII стст.) // Гіст.-археал. зб.: Памяці Міхася Ткачова. Мн., 1993. Ч. 1.

Л.У.Калядзінскі, М.А.Ткачоў.

СЛУ́ЦКІЯ ЖАНО́ЧЫЯ ГІМНА́ЗІІ. Існавалі ў 1907—18 у г. Слуцк Мінскай вобл. (Віленская навуч. акруга).

Слуцкая жаночая прыватная гімназія А.А.Струкоўскага засн. ў 1907. Мела 7 асн. і падрыхтоўчы клас. Утрымлівалася за кошт збораў за навучанне. У 1911 у ёй вучыліся 352 дзяўчыны. Штат складаўся з дырэктара, гал. наглядчыка, 3 законанастаўнікаў, 13 выкладчыкаў і класных наглядчыц, урача і дантыста — выхаванцаў ун-таў Кіева, Масквы, Юр'ева, Віленскага яўр. настаўніцкага ін-та, Пецярб. вышэйшых жаночых курсаў, Вышэйшых Маск. пед. курсаў. Выкладаліся: Закон Божы, рус., ням., франц. мовы, прыродазнаўства, геаграфія, рукадзелле, матэматыка, чыстапісанне, гісторыя, фізіка, касмаграфія, маляванне. Закрыта ў 1912 у сувязі з адкрыццём у Слуцку жаночай гімназіі.

Слуцкая жаночая гімназія адкрыта 11.8.1912. Мела 7 асн. і падрыхтоўчы клас. Пры 1, 6 і 7-м класах былі паралельныя аддзяленні. Утрымлівалася за кошт збораў за навучанне і дапамогі ад казны. У 1915 вучылася 410 дзяўчат. Штат складаўся з начальніка, гал. наглядчыка, 5 законанастаўнікаў, 13 выкладчыкаў, 7 класных наглядчыц, урача і дантыста — выхаванцаў ун-таў Харкава і Пецярбурга, Віленскага яўр. настаўніцкага ін-та, Пецярб. гіст.-філал. ін-та, Мінскай духоўнай семінарыі, Пінскага рэальнага вучылішча, Віленскіх Марыінскіх вышэйшых жаночых курсаў, Пецярб. духоўнай акадэміі, Строганаўскага маст.-прамысл. вучылішча і інш. Выкладаліся: Закон Божы, рус., ням. франц. мовы, асновы педагогікі, прыродазнаўства, геаграфія, рукадзелле, матэматыка, чыстапісанне, гісторыя, фізіка, касмаграфія, спевы, маляванне, гімнастыка. Пры гімназіі быў платны курс закона яўр. веры. Закрыта ў 1918.

Літ.: Асвета і педагагічная думка ў Беларусі: Са старажытных часоў да 1917 г. Мн., 1985; Краткий список учреждений и учебных заведений Виленского учебного округа на 1917 г. Могилев, 1917;. Памятная книжка Виленского учебного округа на 1911/1912 учеб. г. Вильна, 1912. *А.Ф.Самусік.*

СЛУ́ЦКІЯ ЗА́МКІ. Існавалі ў 15—18 ст. у г. *Слуцк* Мінскай вобл. Размяшчаліся ў абалоне р. Случ. Складаліся з Верхняга (Горнага), Ніжняга (Дольнага) і Новага (Цытадэлі) замкаў.

Верхні (Горны) замак займаў прыродную выспу авальнай формы памерам 80 × 100 м, якая ўзвышалася над поймай р. Случ на 5—7 м у сутоках яе з р. Бычок. У 11—14 ст. тут размяшчаўся дзядзінец летапіснага Случаска. Першыя звесткі пра Верхні замак адносяцца да 1409, калі ён згадваецца як умацаванне на насыпаным «капцы» з драўля-

нымі сценамі і вежамі. Па перыметры пляцоўкі быў насыпаны глініста-пясчаны вал шырынёй у аснове 22 м і вышынёй больш за 4 м. З боку поля вал апяразваўся ровам шырынёй 25 м і глыбінёй каля 2 м. Схілы замка былі ўмацаваны дубовымі завостранымі на конус палямі даўжынёй 4—6 м. Паводле інвентарных апісанняў Слуцка за 1627, 1728, 1791, 1793 і 1800, Верхні замак займаў плошчу каля 1,5 га. Цераз абарончы роў быў перакінуты пад'ёмны мост з парэнчамі, які вёў да ўваходнай замкавай брамы. Над ёй мелася высокая вежа з гадзіннікам. На вежы знаходзіўся пакрыты пазалотай медны шар з выявай арла на ім. Замкавая брама мела 4 ярусы бою. Яшчэ ў 1791 тут размяшчаліся 3 гарматы. На восі ўезду стаяў 1-павярховы палац з часаных брусоў на падмурку.

Ніжні (Дольны) замак размяшчаўся на ПнУ ад Верхняга замка (на месцы б. вакольнага горада) і быў аддзелены ад яго запоўненым вадой ровам. Гэты замак быў на 2—3 м ніжэйшы за Верхні і меў выгляд няправільнага чатырохвугольніка плошчай 1,9 га. Ён ахоўваўся земляным валам і драўляным парканам. Паводле інвентара 1687, тут стаялі 3 палацы, зрубленыя з часанага бруса на падмурку, вазоўня, замкавая стайня і інш. гасп. пабудовы. Верхні і Ніжні замкі абмываліся водамі р. Бычок з дапамогай плацін і штучнага рова, які злучаў р. Бычок з р. Случ. У 18 ст. гэтыя замкі мелі назву «Земляны замак».

Новы замак (Цытадэль) размяшчаўся на левым беразе р. Случ на тэр. новага места (горада). Ён меў форму квадрата плошчай 1,1 га з 4 бастыёнамі і адным равелінам. На бастыёнах і курцінах стаялі драўляныя вежы, што не ўласціва для зах.-еўрап. бастыённай фартыфікацыі. Новы замак быў абкружаны вадзяным ровам, злучаным з р. Случ патаемным шлюзам. Уваход у цытадэль вёў цераз мост і браму, якая знаходзілася ў тоўшчы вала. Яна была 1-павярховая і мела вароты з 2 палотнішчаў, збітых з дубовых дошак. Новы замак уваходзіў у сістэму знешніх умацаванняў Слуцка 17—18 ст. Гл. таксама *Слуцкія гарадскія ўмацаванні.*

Літ.: Грицкевич А.П. Древний город на Случи. Мн., 1985; Ткачоў М.А. Замкі і людзі. Мн., 1991; Калядзінскі Л. Верхні замак Слуцка // Бел. гіст. часоп. 1996. № 1.

Л.У.Калядзінскі, М.А.Ткачоў.

СЛУ́ЦКІЯ МАНЕ́ТНЫЯ СКА́РБЫ. 1) Знойдзены ў Слуцку ў 1887. Самы буйны скарб талерных манет на тэр. Беларусі. Ухаваны ў канцы 17 — пач. 18 ст. Знойдзена каля 2 тыс. талераў. Вядомы 33 манеты еўрап. краін: Іспанскіх Нідэрландаў, Злучаных Нідэрландскіх правінцый, Савоі, Германскай імперыі, Швейцарыі. Лёс астатніх невядомы. 2) Знойдзены ў Слуцку ў 1902. Ухаваны ў 1-й пал. 15 ст. Складаўся з 20 залатых манет. Вядомы 4 манеты: англ. ноблі Генрыха IV і перайманні мухрам патанскага султана Дэлі Мухамада ібн Таглука. Лёс астатніх невядомы.

СЛУ́ЦКІЯ ПАЯСЫ́, вырабы ручнога шаўкаткацтва на Беларусі ў сярэдзіне 18—сярэдзіне 19 ст. Назва ад г. Слуцк Мінскай вобл., дзе яны вырабляліся на *Слуцкай мануфактуры шаўковых паясоў.* Напачатку С.п., як і нясвіжскія, капіравалі ўзоры, што прывозілі з Б.Усходу, потым сталі ўключаць у арнамент нац. матывы, кветкі мясц. флоры — васількі, незабудкі і інш. З 1750-х г. у Нясвіжскай, пасля ў Слуцкай мануфактуры працаваў вядомы майстар Я.Маджарскі (гл. ў арт. *Маджарскія*), які распрацаваў новы тып пояса — слуцкі, назва якога стала сінонімам усіх доўгіх шаўковых паясоў. Сувязь з усх. ўзорамі паступова страчвалася. С.п. мелі гарманічныя суадносіны частак, выпрацавалася выразная ўстойлівая структура арнаменту. Бел. майстры пераняліі творча перапрацавалі ўсх. рамяство, надалі яму мясц. характар. Ткалі С.п. даўжынёй 2—4,5 м з шаўковых, залатых, сярэбраных нітак (т.зв. літыя паясы, правы бок іх быў цалкам затканы залатой ніткай, якая закрывала шаўковую аснову). Рабілі паясы аднабаковыя (з адваротным бокам), 2-баковыя (абодва бакі правыя ці адзін двухбаковы і адзін адваротны) і 4-баковыя (па ўсёй даўжыні былі падзелены на палавіны з утком рознага колеру). Пояс складаўся з сярэдніка, аблямоўкі і 2 канцоў. Сярэднік арнаментаваўся папярочнымі гладкімі ці ўзорыстымі палосамі, радзей узор быў сеткавы, у гарошак і інш. На краях пояса ішла арнаментальная аблямоўка (шлячок). Канцы мелі складаную арнаментоўку, найчасцей з 2 матывамі. Найб. тыповыя матывы: авал, абкружаны лісцем са сцяблінкамі і кветкамі; кветкі на доўгі сцябле з галінкамі, якія выходзяць з зямлі ці з ваз; букеты кветак з хвалепадобным абрамленнем. На рагу пояса з абодвух бакоў ткалася метка на стараслав. ці лац. мовах («Слуцк», «У горадзе Слуцку», «Зроблена ў Слуцку»). Канцы пояса часта абшывалі махрамі. Шаўковыя паясы на ўзор слуцкіх выраблялі таксама ў Гродне, Нясвіжы, Ружанах, Кракаве, Ліпкове і Кабылках пад Варшавай, а таксама ў Францыі.

Літ.: Якуніна Л.І. Слуцкія паясы. Мн., 1960.

Дз.С.Трызна.

СЛУЧ, Паўночная Случ, рака ў Мінскай, Гомельскай, на мяжы Гомельскай і Брэсцкай абл., левы прыток р. Прыпяць (бас. р. Дняпро). Даўж. 197 км, пл. вадазбору 5470 км^2. Пачынаецца на Капыльскай градзе за 2 км на ПдУ ад в. Крывая Града Слуцкага р-на Мін-





Слуцкія паясы.

скай вобл., вусце за 5 км на Пд ад в. Вільча Жыткавіцкага р-на Гомельскай вобл. У верхнім цячэнні перасякае зах. ч. Цэнтральнабярэзінскай раўніны, сярэдняе і ніжняе цячэнне ў межах Прыпяцкага Палесся. Даліна ў верхнім цячэнні невыразная, ніжэй трапецападобная, шыр. 0,5—1 км у верхнім, 1,5—2,5 км у сярэднім і ніжнім цячэнні, у вусці пашыраецца да 6 км і зліваецца з далінай р. Прыпяць; схілы спадзістыя, выш. 3—10 м. Пойма пераважна двухбаковая, зрэдку чаргуецца па берагах, роўная, забалочаная, парослая хмызняком, месцамі лесам, на асобных участках перасечана старымі рэчышчамі; шыр. ў вярхоўі 100—400 м, ніжэй 1—1,2 км, у вусці 4—5 км. Рэчышча ў верхнім цячэнні шыр. 6—25 м, да Салігорскага вадасх. на працягу 71 км каналізаванае, ад вадасховішча да вусця р. Морач мелкае, ніжэй — звілістае (шыр. 20—40 м), свабодна меандруе. Асн. прытокі: Лакнея, Морач (справа), Вясейка (злева). У С. перакінуты воды р. Лань (з 1965). Вадасх. Рудня і Салігорскае. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Замярзае ў канцы снеж., крыгалом у канцы сакавіка. Веснавы ледаход у вярхоўі 8 сут, у нізоўі 3 сут. Веснавое разводдзе ад сярэдзіны сак. да пач. мая. Сярэднегадавы расход вады каля в. Ленін 18,3 м^3/с. Выкарыстоўваецца як водапрыёмнік меліярац. сістэм, для водазабеспячэння прадпрыемстваў ВА «Беларуськалій». На рацэ г. Слуцк і г.п. Старобін. *А.А.Макарэвіч.*



Рака **Случ** у Жыткавіцкім раёне Гомельскай вобл.

СЛУЧА́НІН Лявон (сапр. Шпакоўскі Лявон Раманавіч, 15.10.1914, в. Лучнікі Слуцкага р-на Мінскай вобл. — 25.10.1995), бел. паэт. Вучыўся ў Слуцкім педтэхнікуме, Мінскім тэатр. вучылішчы. Скончыў Мінскі вышэйшы пед. ін-т (1936). Настаўнічаў. У 1937 рэпрэсіраваны. Пакаранне адбываў на Беламорканале. У 1939 вызвалены, вярнуўся на радзіму. Настаўнічаў. У час Вял. Айч. вайны працаваў у школе, школьным інспектарам на Случчыне. З 1944 у Германіі, працаваў на фабрыцы, у час. «Малады змагар» (Берлін, 1944—1945). З 1945 на Беларусі. Зноў арыштаваны. Засуджаны на 15 гадоў, пакаранне адбываў на Поўначы. У 1955—73 заг. кансультац. пункта рэсп. завочнай школы Комі. У 1973 вярнуўся на Беларусь. Друкаваўся з 1936. Яго вершы змешчаны ў калект. зб. «Песняры Случчыны» (1943). Аўтар гіст. паэмы «Рагнеда» (1944), аўтабіягр. рамана ў вершах «Алесь Няміра» (нап. 1962—85, апубл. часткова 1991) і інш.

Тв.: Рагнеда: Паэма // Спадчына. 1991. № 1.

СЛУЧАРЭ́ЦКІ ПАВЕ́Т, адм.-тэр. адзінка ў Навагрудскім ваяв. ВКЛ у 1791—93. Цэнтр — г. *Слуцк*. Пасля 2-га падзелу Рэчы Паспалітай (1793) перайменаваны ў *Слуцкі павет*.

СЛУЧЭ́ЎСКІ Канстанцін Канстанцінавіч (7.8.1837, С.-Пецярбург — 8.10.1904), рускі пісьменнік; адзін з папярэднікаў рас. мадэрнізму. Д-р філасофіі. З 1860 вывучаў філасофію і прыродазнаўчыя навукі ў Сарбоне, ун-тах Берліна, Лейпцыга, Гайдэльберга. З 1866 у Расіі. Служыў у Гал. упраўленні па справах друку, мін-ве дзярж. маёмасцей. З 1891 гал. рэдактар «Правительственного вестника». Друкаваўся з 1857. Паэзіі ўласціва спалучэнне імпрэсіяністычнасці вобразаў з празаічнасцю мовы, напружаная эмацыянальнасць і псіхал. глыбіня, жанравая разнастайнасць: зб-кі «Вершы» (1880), «Другая кніга вершаў» (1881), «Песні з Угалка» (1902). Аповесць «Віртуозы» (1882) пра норавы свету. У аповесці «Прафесар бессмяротнасці» (1892) спроба ў фантастычным сюжэце па-мастацку ўвасобіць філас. ідэю бессмяротнасці. Аўтар зб. «Паэмы і хронікі» (1883), геагр.-этнагр. кн. «Па поўначы Расіі» (т. 1—3, 1886—88), рамана «Ад пацалунка да пацалунка» (1872), зб-каў апавяданняў «Трыццаць тры апавяданні» (1887), «Гістарычныя карцінкі. Розныя апавяданні» (1894), серыі брашур, п'ес і інш.

Тв.: Стихотворения и поэмы. М.; Л., 1962; Стихотворения. Петрозаводск, 1981; Стихотворения. Поэмы. Проза. М., 1988.

СЛУ́ШКІ, Служкі, шляхецкі род герба «Астоя» (першапачаткова «Волга») у ВКЛ. Родапачынальнік Ян (Іван; ? — пасля 1472), які ў пач. 15 ст. падлеткам вывезены ў Польшчу, каля 1429 стаў бургграфам Ольштына, у 1436 атрымаў польскую набілітацыю. Яго сын Амяльян вярнуў спадчынныя маёнткі на Беларусі, меў сыноў Рыгора (? — пасля 1517), намесніка цырынскага, і Івана — родапачынальніка Амельяновічаў (Цяпінскіх). Найб. вядомыя С.:

Іван (? — да 1560), сын Рыгора, гараднічы кіеўскі, дзяржаўца любецкі і новагародскі. Мікалай (? — каля 1583), сын Івана, староста крычаўскі з 1577. Аляксандр (каля 1580 — ліп. 1647), староста рэчыцкі, прапойскі, гомельскі, менскі, кашталян менскі ў 1618—28 і жамойцкі ў 1628—38, ваявода новагародскі ў 1638—42 і троцкі з 1642. Зыгмунт Адам (? — 2.12.1674), сын Аляксандра, староста гомельскі, прапойскі, рэчыцкі (1658—72), надворны харунжы ВКЛ у 1649—56, вял. харунжы ВКЛ з 1656. Багуслаў Юрый (? — пасля студз. 1658), сын Аляксандра, староста рэчыцкі з 1639, стольнік ВКЛ у 1643—45, падскарбі надворны ВКЛ з 1645. На яго дзецях род С. згас. Юзаф Багуслаў (22.10.1652—8.10.1701), сын Багуслава Юрыя, староста рэчыцкі ў 1672—88, лоўчы ВКЛ у 1673—76, вял. харунжы ВКЛ у 1676—83, маршалак надворны ў 1683—85, кашталян троцкі ў 1785 і віленскі з 1785, адначасова гетман польны ВКЛ з 1685. Дамінік Міхаіл (каля 1655—31.1.1713), сын Багуслава Юрыя, палкоўнік, староста рэчыцкі, суражскі, барысаўскі, ваявода полацкі з 1686.

У.М.Вяроўкін-Шэлюта.

СЛЫХ, здольнасць арганізма чалавека і жывёл успрымаць гукі *слыху органамі*. С. маюць многія насякомыя, усе пазваночныя, найб. развіты ў млекакормячых. Адчувальнасць С. ацэньваецца па абс. парогу чутнасці (мінім. чутная вухам інтэнсіўнасць гуку). Чалавек успрымае частоты ад 16—20 Гц (ультрагук) да 16—20 кГц (інфрагук). Пры ўздзеянні гукаў вельмі высокай інтэнсіўнасці (каля 140 дБ у чалавека ўзнікае болевае адчуванне, гук у 150 дБ становіцца нясцерпным. Распазнавальныя магчымасці С. ацэньваюцца дыферэнцыяльнымі парогамі (мінім. змена якога-н. пара-

метра гуку, што ўлоўліваецца, — інтэнсіўнасці, частаты і інш). У чалавека ў сярэднім дыяпазоне гукаў дыферэнцыяльны парог па інтэнсіўнасці 0,3—0,7 дБ, па частаце— 2—8 Гц. Здольнасць чалавека даваць абс. ацэнкі выш. муз. гукаў наз. абс. С. (гл. *Слых музычны*). Пры працяглым уздзеянні моцных гукаў адчувальнасць С. паніжаецца (з'ява адаптацыі). Прасторавае становішча крыніцы гуку вызначае бінаўральны С. Гл. таксама *Вуха, Эхалакацыя*. *А.С.Леанцюк.*

СЛЫХ МУЗЫ́ЧНЫ, здольнасць чалавека ўспрымаць, запамінаць, уяўляць асобныя якасці *гукаў музычных*, адчуваць функцыян. сувязі паміж імі; неабходная перадумова кампазітарскай і выканальніцкай дзейнасці. Вылучаюць асн. віды С.м.: а б с а л ю т н ы (здольнасць распазнаваць, вызначаць, уяўляць абс. вышыню асобных муз. гукаў) і а д н о с н ы, ці інтэрвальны (здольнасць выяўляць гукавышынныя суадносіны паміж гукамі). С.м. ўключае пачуцці ладавае і рытму, слых меладыйны, гарманічны і інш. Існуе спецыфічная яго форма — у н у т р а н ы слых (муз.-слыхавыя ўяўленні) — здольнасць мысленна ўяўляць асобныя гукі, меладычна-тэмат. развіццё, гарманічную паслядоўнасць, тэмбрава-каларыстычныя фарбы, тэмп, дынаміку, агогіку, драматургію муз. твора і інш.; неад'емная якасць прафесіяналізму выканаўцы. С.м. развіваецца і ўдасканальваецца ў працэсе заняткаў музыкай, у прыватнасці сальфеджыо. *В.У.Мазанік.*

СЛЫХАВЫ́ АПАРА́Т, гукаўзмацняльная прылада, якая выкарыстоўваецца пры паніжэнні *слыху*. Паляпшае слых і мову хворых, найб. эфектыўны пры хваробах з пашкоджаннем гукаправоднага апарата вуха (напр., *отасклероз*). Складаецца з мікрафона, узмацняльніка і тэлефона. Пераўтварае эл. сігналы ў гукавыя. У С.а. выкарыстоўваюцца паўправадніковыя прылады, інтэгральныя схемы і інш., што забяспечвае значнае ўзмацненне гуку, памяншае габарыты і масу апарата.

СЛЫХАВЫ́Я КО́СТАЧКІ, касцявая гукаправодная сістэма сярэдняга вуха пазваночных жывёл і чалавека. Гл. ў арт. *Вуха, Барабанная перапонка, Барабанная поласць*.

СЛЫ́ХУ О́РГАНЫ, органы пачуццяў чалавека і жывёл, якія ўспрымаюць гукавыя раздражненні (гл. *Слых*). У чалавека і пазваночных жывёл размешчаны ва ўнутр. вуху (гл. *Вуха*) разам з органам раўнавагі (гл. *Вестыбулярны апарат*). У беспазваночных, ніжэйшых хордавых і рыб С.о. ўспрымаюць і гукавыя і вібрацыйныя (мех.) ваганні. С.о. беспазваночных развіты толькі ў насякомых (перапонкі на канечнасцях).

СЛЮ́ДЫ, група пародаўтваральных мінералаў падкласа слаістых сілікатаў. Хім. састаў зменлівы, агульная формула $XY_{2-3}Z_{(AL)_{0-2}}Z_{(Si)_{2-4}}O_{10}(OH, F)_2$, дзе X — калій, натрый, кальцый; Y — алюміній, магній, жалеза (Fe^{2+}), марганец, хром, літый, тытан, Z — крэмній, алюміній, жалеза (Fe^{3+}), тытан (гл. *Сілікаты прыродныя*). Паводе саставу адрозніваюць С. магнезіяльна-жалезістыя (*біятыт*, лепідамілан, флагапіт), алюмініевыя (*мускавіт*, параганіт) і літыевыя (*лепідаліт*, цынвальдыт). Крышталізуюцца ў манакліннай сінганіі.

Утвараюць крышталі таблітчастыя, ліставатыя і лускаватыя масы. Афарбоўка светлая, бясколерная, з фіялетавымі, зялёнымі, бурымі адценнямі да чорнай. У тонкіх пласцінках празрыстыя. Цв. 2—4,5. Шчыльн. 2,3—3,3 г/см^3. С. характэрны вельмі дасканалая спайнасць, высокія электра-, цепла- і гукаізаляцыйныя ўласцівасці. Паходжанне магматычнае, пегматытавае, метамарфічнае, метасаматычнае і інш. Пры выветрыванні ператвараюцца ў *гідраслюды*, потым у *каалін* і хларыты. Выкарыстоўваюцца ў электра-, радыё- і авіяпрамысловасці; літыевыя С. — руда на літый, часам рубідый і цэзій. Радовішчы ў Расіі, Індыі, ЗША, Канадзе, Бразіліі і інш.

СЛЮНЬКО́Ў Мікалай Мікітавіч (н. 26.4.1929, в. Гарадзец Рагачоўскага р-на Гомельскай вобл.), дзяржаўны і парт. дзеяч БССР. Герой Сац. Працы (1974). Засл. работнік прам-сці Беларусі (1972). Скончыў Бел. ін-т механізацыі сельскай гаспадаркі (1962). З 1950 працаваў на Мінскім трактарным з-дзе. З 1960 дырэктар Мінскага з-да запасных частак, з 1965 — Мінскага трактарнага з-да. З 1972 1-ы сакратар Мінскага гаркома КПБ. У 1974—83 нам. старшыні Дзяржплана СССР. З 1983 1-ы сакратар ЦК КПБ. У 1987—91 сакратар ЦК КПСС, адначасова ў 1987—88 заг. эканам. аддзела ЦК КПСС, у 1988—91 старшыня Камісіі ЦК КПСС па пытаннях сац.-эканам. палітыкі. Чл. ЦК КПБ у 1966—76, 1983—90. Чл. ЦК КПСС з 1986, канд. у чл. Палітбюро з сак. 1986, чл. Палітбюро ЦК КПСС у 1987—91. Дэп. Вярх. Савета СССР у 1966—70, 1979—89, нар. дэп. СССР з 1989. Дэп. Вярх. Савета БССР у 1971—75, 1980—90. Дзярж. прэмія СССР 1971.

СЛЮ́ТЭР (Sluter) Клаўс (паміж 1340 і 1350, г. Харлем?, Нідэрланды — студз. 1406), французскі скульптар. Каля 1380 пасяліўся ў Бруселі, з 1385 працаваў у г. Дыжон (Францыя), з 1389 прыдворны майстар бургундскага герцага Філіпа Смелага. Каля 1391—97 выканаў статуі для партала царквы-склепа герцагаў у манастыры Шанмоль у Дыжоне, у т.л. выявы Філіпа Смелага і яго жонкі Маргарыты Фландрыйскай, якім уласцівы жывасць індывідуальных характарыстык. У 1394—1406 з пляменнікам К. дэ Верве стварыў для таго ж манастыра кампазіцыю «Галгофа» (захаваўся пастамент, упрыгожаны статуямі, якія вылучаюцца смелай абагульненасцю пластычнай лепкі, манументальнасцю форм). Творчасць С. паўплывала на развіццё мастацтва Адраджэння ў Францыі, Нідэрландах, Германіі. *Я.Ф.Шунейка.*

СЛЯБ (англ. slab літар. — пліта), стальная загатоўка прамавугольнага сячэння з вял. адносінамі шырыні да вышыні; паўпрадукт металургічнай вытв-сці. Атрымліваюць на машынах *бесперапыннага ліцця* ці *пракаткай* злітка на абціскальным стане — *слябінгу* (радзей *блюмінгу*). Шырыня С. 400—2500 мм, вышыня (таўшчыня) 75—600 мм. Выкарыстоўваюць пераважна для вырабу ліставога праката.



М.М.**Слюнькоў**.



М.Т.**Сляпнёў**.

СЛЯ́БІНГ (англ. slabbing), абціскальны *пракатны стан* для перапрацоўкі буйных стальных зліткаў у *слябы*. Асн. часткі С.: рабочая клець з *валкамі пракатнымі*, гал. электрарухавікі і абсталяванне, што прыводзіць у дзеянне валкі. У адрозненне ад *блюмінга* і *блюмінга-слябінга* мае акрамя гарыз. валкоў яшчэ верт. (для абціскання бакавых кантаў злітка).

СЛЯМНЁЎ Міхаіл Аляксандравіч (н. 15.11.1939, в. Малыя Стайкі Гарадоцкага р-на Віцебскай вобл.), бел. філосаф. Д-р філас. н. (1982), праф. (1982). Засл. дз. нав. Беларусі (1989). Скончыў Віцебскі пед. ін-т (1962), працаваў у ім з 1971 (з 1982 заг. кафедры). З 1990 дэп. Вярх. Савета Рэспублікі Беларусь, старшыня камісіі па нац. палітыцы і міжнац. адносінах. З 1995 ген. консул Рэспублікі Беларусь у г. Беластоку (Польшча). З 1997 заг. кафедры ў Віцебскім філіяле Ін-та сучасных ведаў. Навук. працы па праблемах логікі, метадалогіі навук. пазнання і філас. аспектах прыродазнаўства. Абгрунтаваў эўрыстычную ролю філас. прынцыпаў і паняццяў у навук. пошуку, вызначыў месца ўмоўнасцей і канвенцый у структуры прыродазнаўчых тэорый.

Тв.: Простое и сложное в природе и познании. Мн., 1976; Свобода научного творчества. Мн., 1980; Диалектическая концепция понятия. Мн., 1982 (у сааўт.); Детерминизм: системы, развитие. Мн., 1985 (у сааўт.); Лабиринты познания. Мн., 1988; Диалектика спора. Мн., 1990 (разам з В.Н.Васільковым).

М.П.Савік.

СЛЯНДЗІ́НСКІ Вікенцій (1837, в. Скрабяны каля г. Каўнас, Літва — 1909), бел. мастак. Вычыўся ў Маскоўскім вучылішчы жывапісу, скульптуры і дойлідства ў С.*Заранкі*, дзе атрымаў залаты медаль і 3 сярэбраныя. Пасля паўстання 1863—64 сасланы ў Сібір. Пісаў

жанравыя сцэны з жыцця простага люду з праўдзівай сац. характарыстыкай персанажаў: «Дзяўчынка ля дзвярэй», «Бабулька зацягвае нітку ў вушка іголкі» і інш. Шмат твораў напісаў на дзіцячую тэму, у т.л. «Літоўскія дзеці».

Л.Н.Дробаў.

СЛЯНДЗІ́НСКІ (Slendzinzki) Людамір (1889, Вільня— 1980), польскі мастак, педагог. Вучыўся ў Пецярбургскай АМ (1909—16). У 1925—27 выкладаў у Віленскім ун-це, з сярэдзіны 1940-х г. у Політэхнічным ін-це ў Кракаве. Наведаў Італію, Францыю, Грэцыю, Іспанію, Б.Усход, Афрыку. Прадстаўнік т.зв. новага класіцызму, імкнуўся да аднаўлення жывапіснай тэхнікі старых майстроў, у якую ўводзіў рэальную пазалоту і серабрэнне асобных частак карціны, вял. ўвагу аддаваў малюнку. Гал. тэма творчасці — чалавек. Сярод твораў: «Партрэт жонкі Ірыны» (1925), «Гульня ў гузікі» (1928) і інш.

СЛЯПНЁЎ Маўрыкій Трафімавіч (27.6.1896, в. Ямскавічы Кінгісепскага р-на Ленінградскай вобл., Расія — 19.12.1965), лётчык. Герой Сав. Саюза (1934). Скончыў школы прапаршчыкаў (1915), Гатчынскую лётную (1917) і 1-ю Вышэйшую ваен. лётчыкаў (1923), Ваен.-паветр. акадэмію імя М.Я.Жукоўскага (1936). Удзельнік 1-й сусв. і грамадз. войнаў. З 1925 лётчык грамадз. авіяцыі. За ўдзел у выратаванні людзей з парахода «Чэлюскін», які затануў у Чукоцкім м. (крас. 1934), стаў адным з першых Герояў Сав. Саюза. З 1939 нач. Акадэміі Грамадз. паветр. флоту. У Вял. Айч. вайну нам. камандзіра авіябрыгады ВПС Чарнаморскага флоту (1941—42), потым у ВПС ВМФ і Гал. штабе ВМФ. Чл. ЦВК СССР 1935—37.

СЛЯПНЁЎ Юрый Ільіч (22.5.1926, Масква — 23.7.1965), бел. танцоўшчык. Засл. арт. Беларусі (1955). Вучыўся ў харэагр. студыі пры Маскоўскім Палацы культуры чыгуначнікаў (1943), скончыў Мінскі ін-т фіз. культуры (1961). З 1949 у Бел. ансамблі песні і танца пад кіраўніцтвам Р.Шырмы, з 1950 у Ансамблі песні і танца БВА, з 1952 у Дзярж. нар. хоры Беларусі пад кіраўніцтвам Г.Цітовіча, з 1964 у Бел. філармоніі. Танцоўшчык характарнага плана, стварыў яркія вобразы ў бел. нар. танцах, паставіў танцы «Падушачка», «Ланская кадриля» і інш.

Г.І.Цітовіч.

СЛЯПНІ́ (Tabanidae), сямейства насякомых падатр. прамашыўных каратканвусых атр. двухкрылых. Больш за 3,5 тыс. відаў. Пашыраны амаль паўсюдна, найб. трапляюцца ў лясной, стэпавай і пустыннай зонах у вільготных мясцінах. Найб. актыўныя ў цёплыя сонечныя дні. Могуць быць пераносчыкамі ўзбуджальнікаў інфекц. хвароб. На Беларусі 60 відаў з 8 родаў; найб. трапляюцца С. з роду Tabanus (С. бычыны — T. bovinus, С. летні — T. schineri, С. шэры — T. bronius), а таксама дажджоўкі (Haematopota, або Chrysozona), залатавочкі (Chrysops), хібамітры (Hybomitra) і інш.



Л.**Сляндзінскі**. Партрэт жонкі Ірыны. 1925.

Даўж. да 3 см. Цела ўкрыта кароткімі валаскамі, крылы шырокія, моцныя. Лапкі ног з 3 прысоскамі. Брушка шырокае, пляскатае. Вусікі 3-членікавыя. Ротавыя органы ў самак колюча-сысучыя, лёгка праколваюць скуру пазваночных; у самцоў ліжучыя. Самкі пераважна крывасмокі капытных жывёл і чалавека. Самцы кормяцца сокамі раслін і інш. Развіццё з поўным ператварэннем. Лічынкі жывуць у вадзе, муле, вільготнай глебе, гніючых рэштках раслін. Драпежныя, некат. дэтрытафагі.



Сляпні: 1 — бычыны; 2 — дажджоўка звычайная; 3 — стракач лясны; 4 — стракач звычайны.

Літ.: Мяло И.И. Слепни и защита скота от них. Мн., 1968; Олсуфьев Н.Г. Слепни // Фауна СССР. Л., 1977. Т. 7, вып. 2; Жизнь животных. Т. 3. 2 изд. М., 1984.

С.Л.Максімава.

СЛЯПО́ВІЧ Алена Самойлаўна (н. 13.10.1951, Мінск) бел. псіхолаг. Д-р псіхал. н. (1994), праф. (1997). Скончыла Мінскі пед. ін-т (1972). З 1986 у Бел. пед. ун-це, з 1995 у Акадэміі паслядыпломнай адукацыі, з 1997 у БДУ. Навук. працы па праблемах псіхадыягностыкі і псіхакарэкцыі лёгкіх адхіленняў у развіцці дзяцей, падрыхтоўкі псіхолагаў да работы з дзецьмі з анамальным псіхічным развіццём.

Тв.: Исправление речи у детей. Мн., 1983; Формирование речи у дошкольников с задержкой психического развития. 2 изд. Мн., 1989; Игровая деятельность дошкольников с задержкой психического развития. М., 1990; Работа психолога в системе оказания помощи детям с задержкой психического развития от 0 до 7 лет. Мн., 1994 (разам з Н.А.Масюковай); Ребенок с задержкой психического развития: (Психол. характеристика). Мн., 1996.

СЛЯПЦО́Ў Васіль Аляксеевіч (31.7.1836, г. Варонеж, Расія — 4.4.1878), рускі пісьменнік. Вучыўся ў Маскоўскім ун-це (1854—55). У 1857—62 быў чыноўнікам. Супрацоўнічаў у час. *«Современник»*. Заснавальнік час. «Женский вестник» (1866—68). Стваральнік першай камуны (1863—64), дзе спрабаваў на практыцы ажыццявіць сац. ідэі (усеагульная праца, раўнапраўе жанчын). У 1866 прыцягваўся па справе Дз.*Каракозава*; да канца жыцця знаходзіўся пад наглядам паліцыі. Друкаваўся з 1861 (цыкл нарысаў «Уладзімірка і Клязьма»). «Лісты пра Асташкава» (1862—63) — падарожныя нататкі, якія паказвалі неадпаведнасць паміж абліччам і рэальным становішчам павятовага горада. Аповесць «Цяжкі час» (1865) пра лёс разначынца. Аўтар рамана «Добры чалавек» (1871, не завершаны), апавяданняў, фельетонаў, літ.-крытычных артыкулаў.

Тв.: Соч. Т. 1—2. М., 1957; Неизвестные страницы // Литературное наследство. М., 1963. Т. 71; Избр. произв. Л., 1970; Проза. М., 1986; Трудное время: Рассказы и очерки, повесть. М., 1988.

СЛЯПЦЫ́, сямейства млекакормячых атр. грызуноў, гл. ў арт. *Слепаковыя.*

СЛЯПЯ́Н Рыгор Якаўлевіч (н. 6.5.1952, Мінск), бел. вучоны ў галіне радыёфізікі і электронікі. Д-р фіз.-матэм. н. (1988). Скончыў Мінскі радыётэхн. ін-т (1974). З 1974 у Мінскім н.-д. прыладабуд. ін-це. З 1991 у НДІ ядз. праблем БДУ. Навук. працы па фізіцы мезаскапічных сістэм, тэорыі нелінейных ваганняў і хваль. Даследаваў электрадынаміку вугляродных нанатрубак, эфект анамальнага малога паглынання эл.-

магн. хваль у перыяд. структурах і дастасаванне яго да стварэння звышвысокадыхтоўных ЗВЧ-рэзанатараў.

Тв.: Propagation, scattering and dissipation of electromagnetic waves. London, 1993 (разам з А.С.Ільінскім, А.Я.Сляпянам); Negative differential conductivity in carbon nanotubes (разам з А.С.Максіменкам) // Physical review letters. 2000. Vol. 84, № 2.

СЛЯПЯ́НСКАЕ ВО́ДНА-ПА́РКАВАЕ ПАЎКАЛЬЦО́, сістэма штучных каскадаў, каналаў, адкрытых вадаёмаў і прылеглых азеленených тэрыторый у Мінску, аснова комплекснай арх.-ландшафтнай арганізацыі паўн.-ўсх. часткі горада; частка Мінскага водна-паркавага кальца. Створана на аснове р. Сляпянка і левага прытока р. Свіслач. Пабудавана ў 1977—88. Даўж. 22 км, перапад вышынь рэльефу на трасе 31 м. Уключае вадаёмы (агульная пл. 140 га), каналы і 13 дэкар. каскадаў. Гал. збудаванне сістэмы — Цнянскае вадасховішча, вада ў якое паступае з вадасховішча Дразды праз напорныя вадаводы з уздымам на выш. 15 м. Ад Цнянскага вадасховішча адкрыты канал ідзе ўздоўж лесапарку і заканчваецца дэкар. вадаёмам каля гандл.-грамадскага цэнтра мікрараёна Зялёны Луг 6. За Лагойскім трактам у пачатку мікрараёна Зялёны Луг 5 створаны шматступеньчаты каскад. Уздоўж вул. Сядых сістэма прадстаўлена спалучэннем маляўнічых вадаёмаў і каналаў з масткамі, спускамі да вады, невял. фантанчыкаў і інш. малых арх. форм. Створаны таксама выразны 3-ступеньчаты каскад па вул. Парніковай, паўкруглы 2-ступеньчаты каскад з басейнам у раёне вуліц Уральскай—Мендзялеева і ў жылым раёне Серабранка, дзе Сляпянская водная сістэма злучаецца з Чыжоўскім вадасховішчам. Усе каскады сістэмы створаны паводле індывід. праектаў. Гал. кампазіцыйныя акцэнты арганічна спалучаюцца з прасторавым вырашэннем гэтых раёнаў горада. Запраектавана буд-ва Лошыцкага водна-паркавага паўкальца, у выніку даўж. водна-паркавага кальца Мінска дасягне 50 км суцэльнай сістэмы каналаў, каскадаў, вадаёмаў з прылеглымі да іх паркамі, скверамі, бульварамі. За стварэнне арх.-ландшафтных комплексаў усх. раёнаў Мінска архітэктары Л.Белякова, Дз.Герашчанка, Л.Жлоба, М.Жлоба, В.Шыльнікоўская, Б.Юрцін, інжынер А.Самончык удастоены Дзярж. прэміі СССР 1989. *А.В.Сычова.*



Да арт. **Сляпянскае водна-паркавае паўкальцо**. Дэкаратыўныя басейны ў мікрараёне Зялёны Луг 5.



Сляпянская водная сістэма ў мікрараёне Усход 1.

СЛЯПЯ́НСКАЯ ВО́ДНАЯ СІСТЭ́МА, сістэма вадасховішчаў, каналаў і інш. гідратэхн. збудаванняў ва ўсх. частцы Мінска; уваходзіць у склад *Вілейска-Мінскай воднай сістэмы.* Пабудавана ў 1977—83. Уключае вадасх. *Дразды*, сістэму вадаводаў, *Цнянскае вадасховішча*, закрыты калектар і канал на водападзеле рэк Цна і Слепня, пераўтворанае рэчышча р. Слепня з сістэмай вадаёмаў. *Чыжоўскае вадасховішча.* Вада з вадасх. Дразды па напорным трубаправодзе пампуецца ў наліўное Цнянскае вадасх., адкуль па сістэме каналаў і вадаёмаў і былым рэчышчы р. Слепня самацёкам паступае ў Чыжоўскае вадасховішча. Агульная даўж. сістэмы 26 км. Створаны 13 вадаёмаў (пл. ад 0,2 да 6,4 га, глыб. 0,8—2 м). Прапускная здольнасць сістэмы 1,5 м^3/с. Аб'ём гадавога сцёку каля 8 млн. м^3. С.в.с. выкарыстоўваецца для водазабеспячэння прамысл. прадпрыемстваў, камунальнай гаспадаркі і воднага добраўпарадкавання ўсх. ч. Мінска. Уздоўж сістэмы зялёныя масівы агульнага карыстання, што паляпшае мікраклімат прылеглых тэрыторый, стварае спрыяльныя рэкрэацыйныя ўмовы для мясц. жыхароў (гл. *Сляпянскае водна-паркавае паўкальцо*).

А.А.Макарэвіч.

СЛЯСА́РНА-ЗБО́РАЧНЫ ІНСТРУМЕ́НТ, ручны і механізаваны інструмент для слясарна-зборачных работ. Падзяляецца на інструмент для разметачных, кантрольна-вымяральных, апрацоўчых, зборачных і аддзелачных аперацый.

Для разметкі і вымярэнняў выкарыстоўваюць *лінейкі, лякалы, рулеткі, рэйсмусы*, вугольнікі, штангенцыркулі, кронцыркулі, вугламеры, чарцілкі, кернеры; для ўстаноўкі і фіксавання вырабаў і загатовак — *дамкраты*, ціскі, шрубцынгі, пласка- і круглагубцы, пасатыжы, а таксама спецыялізаваныя зборачныя прыстасаванні; для рубкі і рэзання металу — зубілы, крэйцмейселі, *нажоўкі*, нажніцы па метале, шліцоўкі, трубарэзы; для ўдарных работ (гнущё, праўка) і клёпкі — малаткі, кіянкі, кувалды, падтрымкі, абціскачкі, нацяжкі; для свідравання і апрацоўкі адтулін — *дрылі, зенкеры, калаўроты, разгорткі, свердлы*; для наразання разьбы — *метчыкі, плашкі*, калаўроцікі, плашкатрымальнікі, клупы; для падгоначных работ (абпілоўвання) — *абразіўныя інструменты*, напільнікі, рашпілі, надфілі, шаберы, прыціры; для зборкі разьбовых злучэнняў — гаечныя і развадныя ключы, адвёрткі, гайка- і шпількавёрткі; для пайкі — *паяльнікі, паяльныя лямпы.* Шэраг слясарных работ робіцца *кавальскім інструментам, металарэзным інструментам, ручнымі машынамі.*

Літ.: Крупицкий Э.И. Слесарное дело. 3 изд. Мн., 1970; Дмитрович А.М. Книга для начинающего слесаря. 2 изд. Мн., 1991; Инструменты и приспособления. 2 изд. Мн., 1997; Умелец в доме: Энцикл. для всех. М., 1998. *У.М.Сацута.*

СМА́ГА, агульнае пачуццё, якое развіваецца пры абядненні арганізма вадой

або пры парушэнні ў крыві нармальных суадносін паміж вадой і мінер., а таксама арган. рэчывамі. Узнікае пры павышэнні асматычнага і анкатычнага ціску крыві і спіннамазгавой вадкасці, што звязана з павелічэннем у іх саставе канцэнтрацыі іонаў натрыю. У выніку ў галаўным мозгу ўзбуджаецца пітны цэнтр і адбываецца перабудова нейрагумаральнай рэгуляцыі, якая забяспечвае захаванне водных рэсурсаў арганізма, а таксама выклікае паводзінскія рэакцыі, звязаныя з пошукамі і ўжываннем вады. Фізіял. С. выклікаецца стратай прыблізна 350 мл вады ў чалавека масай 70 кг.

А.С.Леанцюк.

СМАГАРО́ВІЧ Марка Станіслававіч (н. 28.2.1927, в. Забалацце Акцябрскага р-на Гомельскай вобл.), бел. паэт. У Вял. Айч. вайну ў партыз. атрадзе, у выніку ранення застаўся без рук. Друкуецца з 1951. У вершах — суровая памяць вайны, апяванне хараства роднага краю, справы сучаснікаў: зб-кі «Мой таварыш» (1955), «На крыллях песні» (1958), «Маё выступленне» (1961), «Крокі» (1966), «Пачастунак» (1969), «Разводдзе» (1973), «Сплаў» (1976), «Жорны віру» (1980), «Бляск крышталю», (1983), «Далоні Радзімы» (1994). Піша для дзяцей: зб-кі «Каля кастра» (1959), «Жураўліная труба» (1968), «Паглядае Дзіма ў неба» (1978), «Гартаванне» (1987). Сатыр. вершы ў зб. «Са свайго пункту гледжання» (1966, з М.Макаевым і І.Шуцько).

СМАГАРЫ́Н, вёска ў Ровенскаслабодскім с/с Рэчыцкага р-на Гомельскай вобл. Цэнтр калгаса. За 24 км на Пд ад горада і чыг. ст. Рэчыца, 64 км ад Гомеля. 202 ж., 96 двароў (2001). Клуб, б-ка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызана.

СМАК, адчуванне, якое ўзнікае пры ўздзеянні раствораў хім. рэчываў на рэцэптары *смаку органаў* у жывёл і чалавека. Асн. смакавыя адчуванні — кіслае, салёнае, салодкае, горкае. Вызначаюцца канфігурацыяй малекул рэчываў, што адсарбіруюцца на рэцэптарах органаў С., і дзейнасцю смакавай сістэмы. Усе складаныя смакавыя адчуванні ўтвараюцца камбінацыяй асн. і з'яўляюцца вынікам адначасовага паступлення ў нерв. цэнтры інфармацыі ад смакавых, нюхальных, а таксама болевых, тактыльных, тэмпературных рэцэптараў ротавай поласці (напр., жыгучы і востры С. выклікаецца раздражненнем болевых рэцэптараў). Пры працяглым уздзеянні рэчыва на рэцэптар паніжаецца смакавая адчувальнасць да яго ў выніку адаптацыі. Адаптацыя да салодкага і салёнага адбываецца хутчэй, чам да горкага і кіслага. У ходзе эвалюцыі С. фарміраваўся як механізм, што вызначаў паводзінскія рэакцыі па выбары якаснай ежы.

А.С.Леанцюк.

СМАКО́ЎНІЦА, кветкавая расліна, тое, што *інжыр*.

СМАКТУНО́ЎСКІ Інакенцій Міхайлавіч (28.3.1925, с. Таццянаўка Шагарскага р-на Томскай вобл., Расія — 3.8.1994), расійскі акцёр. Нар. арт. СССР (1974). Герой Сац. Працы (1990). Вучыўся ў студыі Краснаярскага т-ра (1945—46). Працаваў у т-рах Нарыльска, Махачкалы, Валгаграда, Масквы (1946—57), у Ленінградскім Вял. драм. т-ры імя М.Горкага (1957—60), з 1971 у Малым т-ры (Масква), з 1976 у Маскоўскім маст. акад. т-ры (МХАТ; з 1989 МХАТ імя А.Чэхава). Для творчай манеры характэрны вытанчаны інтэлектуалізм, арыгінальнасць і глыбіня трактоўкі



М.С.**Смагаровіч**.



І.М.**Смактуноўскі**.

сцэн. твораў, складанасць псіхал. малюнка роляў, сярод якіх найб. значныя: князь Мышкін («Ідыёт» паводле Ф.Дастаеўскага), Цар Фёдар («Цар Фёдар Іааннавіч» А.Талстога), Іванаў, Дорн («Іванаў», «Чайка» А.Чэхава), Іудушка Галаўлёў («Паны Галаўлёвы» паводле М.Салтыкова-Шчадрына), І.Бах («Магчымая сустрэча» П.Барца) і інш. Здымаўся ў кіно: «9 дзён аднаго года», «Гамлет», «Сцеражыся аўтамабіля», «Злачынства і пакаранне», «Маленькія трагедыі», «Дамскі шавец» і інш. Ленінская прэмія 1965. Дзярж. прэмія Расіі 1971.

Літ.: Горфункель Е.И. Смоктуновский. М., 1990.

СМАКТУНЫ́, клас плоскіх чарвей, гл. *Трэматоды*.

СМАКТУНЫ́-МНАГАВУ́СНІКІ, клас плоскіх чарвей, гл. *Монагенетычныя смактуны*.

СМА́КУ О́РГАНЫ, смакавыя цыбуліны, органы, якія ўспрымаюць смакавыя раздражненні.

У чалавека смакавыя цыбуліны (да 10 тыс.) размешчаны ў эпітэліі рота, языка, пярэдняга аддзела глоткі, стрававода і гартані. У дзяцей — у эпітэліі губ, надгартанніка, галасавых звязак. Маюць эліпсападобную форму, утвораны 30—80 прадаўгаватымі смакавымі клеткамі. Верхняя ч. смакавай клеткі мае мікравырасты, якія ўспрымаюць раздражненні смакавых рэчываў. Узбуджэнне смакавых клетак па нерв. валокнах перадаецца ў кару галаўнога мозга, дзе фарміруецца *смак*. У насякомых С.о. прадстаўлены конусападобнымі вырастамі на сценках рота і стрававода. У рыб у поласці рота каля 20 тыс. смакавых цыбулін, у птушак 80—400, у млекакормячых да 2 тыс.

А.С.Леанцюк.

СМА́ЛЕНКАЎСКІ ВЯЛІ́КІ КА́МЕНЬ, геалагічны помнік прыроды рэсп. значэння (з 1996). Размешчаны за 500 м на ПнУ ад в. Смаленка Ашмянскага р-на Гродзенскай вобл. Цёмна-шэры разгнейсаваны граніт з ружовымі жылкамі і крышталямі палявога шпату (таблічкі і авоіды ад 1 да 4 см). Даўж. 5,4 м, шыр. 1,9 м, выш. 1,3 м, у абводзе 12 м, аб'ём 14 м^3, маса каля 36 т. Прынесены ледавіком каля 150 тыс. гадоў назад з Фенаскандыі.

В.Ф.Вінакураў.

СМАЛЕ́НСК, горад, цэнтр Смаленскай вобл. Расіі, на берагах р. Дняпро. 353 тыс. ж. (2000). Рачная прыстань, вузел



Смаленск. Гістарычны цэнтр горада.

чыгунак і аўтадарог. Важны трансп. цэнтр на шляхах з Расіі ў Беларусь і Зах. Еўропу. Прам-сць: маш.-буд. (ВА «Аналітпрыбор» і «Іскра», НВА «Тэхнапрыбор», з-ды авіяц., «Вымяральнік», аўтаагрэгатны, сродкаў аўтаматыкі, гандл. абсталявання, халадзільнікаў, электралямпавы), лёгкая (ільнокамбінат, трыкатажная, панчошная, абуткавая ф-кі і інш.), харч. (мясакамбінат, лікёра-гарэлачны, піваварны з-ды, 2 малаказаводы, макаронная ф-ка), буд. матэрыялаў. Мэблевы камбінат. 7 ВНУ. Планетарый.

Вядомы з 863. Узнік як цэнтр слав. племя *крывічоў* на стараж. гандл. шляху «з варагаў у грэкі». З 882 у складзе Кіеўскай дзяржавы. З 1-й пал. 12 ст. адм. і культ. цэнтр *Смаленскага княства*, меў сваю епіскапскую кафедру. У 2-й пал. 12 ст. абвастрылася саперніцтва С. з Полацкам. У 1229 разам з Полацкам і Віцебскам заключыў гадл. і паліт. пагадненне з Рыгай (гл. *Дагавор 1229*). У 1404—1514 у складзе ВКЛ. Важны цэнтр бел. летапісання, тут створаны *Смаленскі летапіс*, *«Смаленскія граматы XIII—XIV стст.»*, *Смаленская хроніка*, *Беларуска-літоўскі летапіс 1446*. Смаленскі полк удзельнічаў у *Грунвальдскай бітве 1410*. У 15—17 ст. цэнтр *Смаленскага ваяводства*. Адбылося *Смаленскае паўстанне 1440*. З 1514 у складзе Рус. дзяржавы. У 1596—1602 узведзена каменная крапасная сцяна. У 1611 заняты войскамі Рэчы Паспалітай. Паводле *Дэулінскага перамір'я 1618* адышоў да Рэчы Паспалітай. У 1654 узяты рус. войскамі. Паводле *Андросаўскага перамір'я 1667* пакінуты ў складзе Расіі. У 1708 утворана *Смаленская губерня*. У 1719—26 цэнтр Смаленскай прав. Рыжскай губ., у 1776—96 — Смаленскага намесніцтва. У вайну 1812 каля С. адбылася *Смаленская бітва 1812*. Будаўніцтва у 2-й пал. 19 ст. Рыжска-Арлоўскай (1868), Маскоўска-Брэсцкай (1870) і Разана-Уральскай (1899) чыгунак садзейнічала эканам. развіццю горада. У 1918 цэнтр *Заходняй камуны*. У С. ў 1918 дзейнічаў *Абласны выканаўчы камітэт Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў Заходняй вобласці і фронту* (Аблвыкамзах), 30—31.12.1918 у С. адбыўся *Першы з'езд КП(б)Б*, які абвясціў утварэнне БССР, у 1918—39 знаходзіўся акр. ваен. камісарыят Беларускай ваен. акругі. У 1920 у С. выдавалася газ. «Савецкая Беларусь». У 1922—23 і 1925—27 дзейнічала Беларуская секцыя пры Смаленскім губернскім аддзеле нар. асветы, якая супрацоўнічала з Бел. студэнцкім зямляцтвам у С. (існавала ў 1924—29 пры Смаленскім ун-це). У С. ў розны час жылі і працавалі бел. пісьменнікі М.І.Гарэцкі, Я.Купала, вучоныя У.М.Дабравольскі, А.М.Ляўданскі, І.М.Хозераў і інш. З 1929 цэнтр Заходняй, з 1937 — Смаленскай вобл. У Вял. Айч. вайну пасля *Смаленскай бітвы 1941* захоплены ням.-фаш. войскамі. Вызвалены ў выніку *Смаленскай аперацыі 1943*. У 1985 С. прысвоена ганаровае званне «Горад-герой».

На левым беразе Дняпра знаходзіцца старая ч. горада — *Смаленскі крэмль* з Успенскім саборам (17 ст.). Пасля вайны 1812 С. развіваўся паводле плана (1818), які спалучаў прамавугольную планіроўку цэнтра з сістэмай радыяльных вуліц стараж. ч. горада. Сярод арх. помнікаў: цэрквы Пятра і Паўла на Гарадзянцы (1146, перабудавана ў 1753—57, рэстаўрыравана ў 1962—63; побач — палаты уніяцкага епіскапа, 1632), Іаана Багаслова на Варажках (12 ст., перабудавана ў 18 ст.), Міхаіла Архангела (Свірская, 1191—94), Узнясенская (1694—98, арх. Г.Вахрамееў, паводле чарцяжоў Пятра I; паўн. прыдзел — 1764, арх. М.Ф.Казакоў); ансамбль Троіцкага манастыра з саборам (1738—40, арх. І.Калінік) і званіцай (1770-я г.); барочны Праабражэнскі сабор Аўраміева манастыра (1755); будынак б. дваранскага сходу (1825, арх. А.Мельнікаў, класіцызм) і інш. Помнікі 12—13 ст. маюць рысы *Полацкай школы дойлідства* і *Смаленскай школы дойлідства*. У С. гіст. і арх.-маст. музей-запаведнік, музей скульптуры імя С.Канёнкава, маст. галерэя (калекцыя абразоў 14—16 ст., рус. і зах.-еўрап. мастацтва), музеі Вял. Айч. вайны, смаленскага лёну. Манументы Айч. вайны 1812 (1842, 1912); помнікі: М.Глінку (1885, скульпт. А.Бок, ажурная рашотка з нотнымі знакамі па творах Глінкі, паводле праекта І.Багамолава), М.Мікешыну (1990), Ф.Каню (1991). Т-ры: драмы, лялек; філармонія.

Літ.: Смоленск: Крат. энцикл. Смоленск, 1994; Смоленск и Гнездово (К истории древнерус. города). М., 1991; Раппопорт П.А., Смирнова А.Т. Архитектурные достопримечательности Смоленска. М., 1976; Никерова О.В. Смоленск. Смоленск, 2000.

«СМАЛЁНСК», рачны манітор *Пінскай ваеннай флатыліі*, які вызначыўся ў абарончых баях на тэр. Беларусі і Украіны ў пач. Вял. Айч. вайны. Пабудаваны ў 1925—26 у г. Кракаў (Польшча). Да 24.10.1939 наз. «Кракаў» і ўваходзіў у склад Пінскай флатыліі ВМС Польшчы. У вер. 1939 у час паходу Чырв. Арміі ў Зах. Беларусь затоплены польскім экіпажам у Каралеўскім (Дняпроўска-Бугскім) канале. Падняты, адрамантаваны, пераўзброены і ўключаны ў *Дняпроўскую ваенную флатылію* пад назвай «С.»; з чэрв. 1940 у Пінскай ваен. флатыліі. Меў на ўзбраенні 4 гарматы і 3 кулямёты, экіпаж — 36 чал. З ліп. 1941 вёў баі на Бярэзіне (найб. вызначыўся экіпаж у ноч на 26.7.1941 каля г.п. Парычы Гомельскай вобл., дзе амаль на суткі затрымаў пераправу ням.-фаш. войск), з вер. вёў баі на Дняпры (Кіеўскі напрамак) і Дзясне (раён Чарнігава). У сувязі з немагчымасцю прарвацца ў Кіеў узарваны экіпажам 15.9.1941.

Літ.: Павлович Р.К. Речные военные флотилии в Беларуси (1940—1951 гг.). Мн., 2001. *Р.К.Паўловіч.*

СМАЛЁНСКАЕ ВАЯВО́ДСТВА, адм.-тэр. адзінка ВКЛ у 15—17 ст. Цэнтр — г. *Смаленск*. Утворана ў 1404 вял. кн. ВКЛ Вітаўтам замест *Смаленскага княства*. У ходзе *вайны Маскоўскай дзяржавы з Вялікім княствам Літоўскім 1512—22* С.в. занята ў 1514 маскоўскім войскам, створаны Смаленскі павет. У час *вайны Рэчы Паспалітай з Расіяй 1609—18*, калі Смаленшчына была занята войскамі Рэчы Паспалітай, сойм у 1613 аднавіў С.в. ў складзе ВКЛ, што прызнала і Расія ў *Дэулінскім перамір'і 1618*. С.в. падзялялася на Смаленскі і Старадубскі паветы. У 1638 са Смаленскага пав. перададзены ў Полацкае ваяв. Невельская, Себежская і Краснагорская воласці. У выніку *Палянаўскага міру 1634*, якім скончылася *вайна Расіі з Рэччу Паспалітай 1632—34*, у 1634—45 са





Смаленск. Успенскі сабор (злева), Манумент Айчыннай вайны 1812.



Смаленск. Царква Пятра і Паўла на Гарадзянцы.



Рачны манітор «**Смаленск**».

складу С.в. вылучаны і перададзены Расіі Сярпейская і Трубчэўская воласці. У С.в. насаджалася шляхецкае землеўладанне на ленным праве. У 1633 атрымаў у лен Невельскую і Себежскую вол. К.*Радзівіл.* 9 гарадоў С.в. ў 1611—26 атрымалі магдэбургскае права, у Смаленску створаны 4 рамесныя цэхі. У 1654 у ходзе *вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—67* С.в. занята рас. войскамі. Паводле *Андросаўскага перамір'я 1667* Смаленшчына засталася ў складзе Расіі, аднак паводле *«Вечнага міру» 1686* у склад ВКЛ вернуты Невельская і Себежская воласці.

СМАЛЕ́НСКАЕ КНЯ́СТВА, феадальная дзяржава ў 12—15 ст. Цэнтр — г. *Смаленск*. Займала тэр. сучасных Смаленскай, часткі Маскоўскай, Калужскай, Цвярской, Бранскай абл. Расіі, усх. раёнаў Магілёўскай і Віцебскай абл. Беларусі. Паліт. адасабленне Смаленска пачалося ў 11 ст., але да пач. 12 ст. ён заставаўся кіеўскай воласцю. Самастойным С.к. стала пры Расціславе Мсціславічу [1125—59], пры якім дасягнула найб. памераў. На тэр. сучаснай Беларусі былі размешчаны гарады С.к. Орша, Копысь, Мсціслаў, Лучын, Друпой (Слаўгарад), Крэчут (Крычаў), воласці Басея, Вітрына, Мірачыцы; у 2-й пал. 12 — 1-й пал. 13 ст. пад кантролем Смаленска часта знаходзіліся Віцебск і Друцк. Пры Расціславе Мсціславічу пачалося драбленне С.к. на ўдзелы. У 12 ст. вылучыліся Васілеў, Красн, Мсціслаў, у 13 ст. — Таропец, Вязьма, Мажайск. У пач. 14 ст. Смаленск канчаткова страціў кантроль над Віцебскам, але ў сферу яго ўплыву трапіў Бранск. У пач. 14 ст. ад С.к. адышлі да ВКЛ землі Падняпроўя, басейн Проні і верхняе Паволжа. Пры кн. Іване Аляксандравічу [1313—58] Смаленск трывала трапіў пад уплыў ВКЛ. Кн. Святаслаў Іванавіч [1358—86] імкнуўся да захавання незалежнасці С.к., але ў выніку паходаў войск ВКЛ яно страціла значную частку тэрыторыі на Пд і Пн, у т.л. Мсціслаў і Ржэў. Святаслаў Іванавіч загінуў у *Мсціслаўскай бітве 1386.* Апошнія смаленскія князі Юрый Святаславіч [1386—92] і Глеб Святаславіч [1392—96] знаходзіліся пад уплывам ВКЛ. Скарыстаўшы міжусобіцу паміж Глебам і Юрыем, вял. князь ВКЛ Вітаўт у 1396 захапіў Смаленск і пасадзіў там сваіх намеснікаў. Юрый Святаславіч з дапамогай разанскага князя ў 1401 вярнуў Смаленск. Вітаўт спрабаваў заняць горад у 1401, 1402 і 1403; у 1403 ён захапіў Мажайск, і Смаленск апынуўся ў акружэнні зямель ВКЛ. Скарыстаўшы нейтралітэт Масквы і смерць разанскага князя ў 1404, Вітаўт вярнуў Смаленск. С.к. ліквідавана і на яго аснове створана *Смаленскае ваяводства.* *А.А.Мяцельскі.*

СМАЛЕ́НСКАЕ ПАЎСТА́ННЕ 1440, выступленне жыхароў Смаленска супраць улады ВКЛ і за аднаўленне самастойнага *Смаленскага княства.* Пачалося вясной 1440, калі смаленскі ваявода А.Саковіч пачаў прыводзіць смалян да прысягі на вернасць новаму вял. кн. ВКЛ Казіміру IV Ягелончыку. У горадзе актывізавалася групоўка баяр і «чорных людзей», якая абапіралася на падтрымку ўшчэмленых у паліт. правах правасл. феадалаў усх. рэгіёнаў ВКЛ. Карыстаючыся тым, што значная частка па-пралітоўску настроеных баяр выехала ў Вільню на выбранне новага вял. князя, частка жыхароў горада ўзняла паўстанне. Пасля перамогі над паўстанцамі Саковіч выехаў з горада, але смаляне не скарыліся і запрасілі да сябе ваяводам дарагабужскага кн. Андрэя Дзмітрыевіча, а потым «к собе оспадарем» мсціслаўскага кн. Юрыя Лугвенавіча (гл. ў арт. *Мсціслаўскія*). Ён вырашыў не падначальвацца Казіміру, арыштаваў у Смаленску баяр, што ездзілі да Казіміра, канфіскаваў іх маёмасць і раздаў яе сваім прыхільнікам. Як і ў 1432 (гл. *Свідрыгайлы паўстанне 1432—39*), ВКЛ зноў апынулася на мяжы расколу на 2 дзяржавы. Казімір вырашыў задушыць мяцеж. Але пасланыя ім войскі прастаялі пад Смаленскам 3 тыдні, не наважыліся на штурм і вярнуліся назад. У ліст. 1440 сам Казімір з войскам пайшоў на Смаленск. Юрый, не маючы дастаткова сіл, уцёк у Маскву, а адтуль у Вял. Ноўгарад. *А.А.Мяцельскі.*

СМАЛЕ́НСКАЕ ЎЗВЫ́ШША. Знаходзіцца пераважна ў Смаленскай вобл. Расіі, займае невялікую тэр. у Дубровенскім і Аршанскім р-нах Віцебскай вобл. Беларусі. Працягваецца ад г. Орша на правым беразе р. Дняпро да вярхоўяў рэк Вора і Масква на У. Выш. да 319 м (на ПдЗ ад г. Вязьма). Яе аснова на крайнім З складзена гал. ч. з даламітаў і вапнякоў дэвону, на У ад г. Смаленск — вапнякоў, глін, мергеляў карбону. Пераважае марэнна-эразійны рэльеф; на ПнЗ раён узгорыста-градавага рэльефу. Пакрыта шыракаліста-яловымі і ялова-шыракалістымі лясамі. Глебы сугліністыя, пераважна дзярнова-сярэднепадзолістыя. Значныя плошчы пад ворывам і лугамі.

СМАЛЕ́НСКА-МАСКО́ЎСКАЕ ЎЗВЫ́ШША, агульная назва *Смаленскага ўзвышша* (пераважна на тэр. Смаленскай вобл.) і Маскоўскага ўзвышша (на тэр. Маскоўскай і Уладзімірскай абл.).

СМАЛЕ́НСКАЯ АПЕРА́ЦЫЯ 1943, наступальная аперацыя войск Заходняга (камандз. ген.-палк., са жн. 1943 ген. арміі В.Д.*Сакалоўскі*) і левага крыла Калінінскага (ген.-палк. А.І.*Яроменка*) франтоў 7 жн.—2 кастр. ў Вял. Айч. вайну. Мэта аперацыі — разграміць левае крыло ням.-фаш. групы армій «Цэнтр» (камандз. ген.-фельдмаршал Г.Клюге) і вызваліць Смаленск. Ням.-фаш. камандаванне стварыла на гэтым напрамку моцную абарону, сканцэнтравала 44 дывізіі (да 850 тыс. чал., каля 8800 гармат і мінамётаў, каля 500 танкаў і штурмавых гармат, да 700 самалётаў). У складзе Зах. і Калінінскага франтоў налічвалася 1253 тыс. чал., 20 640 гармат і мінамётаў, 1436 танкаў і самаходных артыл. установак, 1100 самалётаў. С.а. ўключала 4 аб'яднаныя агульнай задумай франтавыя аперацыі: Спас-Дземенскую. Ельнінска-Дарагабужскую, Духаўшчынска-Дзямідаўскую і Смаленска-Рослаўскую. 7 жн. з раёна на У ад Спас-Дземенска перайшла ў наступленне ўдарная групоўка Зах. фронту, за 14 дзён яна прасунулася на 30—40 км, 13 жн. вызваліла Спас-Дземенск. На Духаўшчынскім напрамку наступленне пачалі войскі Калінінскага фронту. 30 жн. войскі Зах. фронту авалодалі Ельняй, іх правае крыло фарсіравала Дняпро і 1 вер. вызваліла Дарагабуж. У выніку наступлення Зах. і Калінінскага франтоў вызвалены: 16 вер. Ярцава, 21 вер. Дзямідаў, 25 вер. Смаленск і Рослаўль, 28 вер. г. Мсціслаў — райцэнтр Магілёўскай вобл. 2 кастр. С.а. закончылася. Зах. і Калінінскі франты выйшлі на рубеж Рудня, на У ад Краснага, Горак, Дрыбіна, далей па р. Проня і ўступілі ў межы ўсх. раёнаў Беларусі, дзе перайшлі да абароны. У выніку С.а. ад акупантаў поўнасцю вызвалены Смаленская і частка Калінінскай абл., некалькі раёнаў Магілёўскай вобл., усяго вызвалена больш за 7,5 тыс. населеных

пунктаў. Значную дапамогу сав. войскам у С.а. аказалі партызаны. У ноч на 3 жн. яны нанеслі масіраваныя ўдары па чыг. камунікацыях праціўніка і працягвалі іх увесь жн. і 1-ю пал. верасня; 19 вер. пачаўся 2-і этап *«рэйкавай вайны»* (умоўная назва *«Канцэрт»*). У выніку гэтых аперацый рух па чыг. камунікацыях ням. групы армій «Цэнтр» быў у значнай меры паралізаваны. Агульны аб'ём перавозак скараціўся на 40%.

У.І.Лемяшонак.



СМАЛЕ́НСКАЯ БІ́ТВА 1812, абарончыя баявыя дзеянні рас. войск 16—18 жн. супраць напалеонаўскіх войск у *вайну 1812*. Гал. сілы праціўніка (больш за 180 тыс. чал.) пасля кароткага адпачынку ў 1-й пал. жн. аднавілі наступленне з мэтай авалодаць г. Смаленск і выйсці ў тыл 1-й і 2-й арміям, якія дзейнічалі ў раёне Рудні і Парэчча. Выкарыстаўшы нерашучасць рас. войск, французы фарсіравалі Дняпро ў раёне Расасна, Ляды і рушылі да Смаленска. 16 жн. рас. войскі адбілі іх атакі. Аднак галоўнакамандуючы М.Б.*Барклай-дэ-Толі*, каб захаваць армію, якая мела менш сіл і сродкаў, чым французы, вырашыў пакінуць Смаленск і загадаў 2-й арміі адыходзіць па Маскоўскай дарозе, а 1-й арміі ўтрымліваць горад для забеспячэння адыходу. У ноч на 17 жн. 2-я рас. армія пад прыкрыццём 1-й арміі пачала адыход на Дарагабуж. Увесь наступны дзень рас. войскі пад агульным камандаваннем ген. Дз.С.Дахтурова адбівалі атакі ворага. У баях за Смаленск асабліва вызначыліся палкі (у т.л. Літоўскі ўланскі полк), дывізіі, атрады пад кіраўніцтвам ген. М.М.*Раеўскага*, Дз.П.*Неяроўскага*, І.Ф.*Паскевіча*, П.П.Канаўніцына і інш. У ноч на 18 жн. войскі Дахтурова пераправі́ліся на правы бераг Дняпра, узарвалі масты, пакінулі горад і выйшлі на Маскоўскую дарогу. Паводле рас. звестак, франц. армія за 2 дні баёў страціла больш за 20 тыс. чал. (па падліках франц. боку гэтыя страты складалі 14 тыс. чал.). Рас. войскі страцілі 10 тыс. чал.

Літ.: Гл. пры арт. *Вайна 1812.*

СМАЛЕ́НСКАЯ БІ́ТВА 1941, комплекс абарончых і наступальных дзеянняў сав. войск Заходняга (каманд. Маршал Сав. Саюза С.К.*Цімашэнка*), Рэзервовага (ген. арміі Г.К.*Жукаў*), Цэнтральнага (ген.-палк. Ф.І.*Кузняцоў*, са жн. ген.-лейт. М.Р.*Яфрэмаў*) і Бранскага (ген.-лейт. А.І.*Яроменка*) франтоў на зах. напрамку 10 ліп. — 10 вер. ў Вял. Айч. вайну. Мэта С.б. — не дапусціць прарыву ням.-фаш. войск да Масквы. У сувязі з неспрыяльным ходам *прыгранічных бітваў 1941* Гал. камандаванне з канца чэрв. пачало разгортваць на рубяжы Зах. Дзвіны і Дняпра ад Краславы да Лоева войскі 2-га стратэг. эшалона (22-я, 19, 20, 16, 21-я арміі), якія ў пач. ліп. ўвайшлі ў склад Зах. фронту. На Смаленскім напрамку група герм. армій «Цэнтр» (2-я і 3-я танк. групы, 9-я і 2-я арміі; камандуючы ген.-фельдмаршал Ф.*Бок*) да пач. бітвы пераўзыходзіла войскі Зах. фронту ў людзях, артылерыі і самалётах у 2 разы, у танках у 4 разы. 10.7.1941 яна пачала наступленне ад Себежа на Ідрыцу, ад Дрысы на Невель, з раёна Віцебска на Дзямідаў і Ярцава — у абход Смаленска з Пн, з раёна Магілёва — у абход Смаленска з Пд і на Рослаўль, каб акружыць сав. войскі, авалодаць раёнам Орша—Віцебск—Смаленск і адкрыць шлях на Маскву. Сав. войскі проціпаставілі наступаючым упартую абарону на многіх рубяжах і моцныя контрудары. 13 ліп. войскі 21-й арміі (на гал. напрамку 63-і стралк. корпус камкора Л.Р.*Пятроўскага*) фарсіравалі Дняпро, вызвалілі Жлобін, Рагачоў (гл. *Рагачоўска-Жлобінская аперацыя 1941*) і развілі наступленне на Бабруйск. Акружаная ў Магілёве частка сіл 13-й арміі разам з апалчэнцамі змагалася да 26 ліп. (гл. *Магілёва абарона 1941*). Пад Оршай 14 ліп. ўпершыню выкарыстаны рэактыўныя мінамёты («кацюшы»). 21 ліп. контрударам вораг выбіты з Вялікіх Лук. Калі 16 ліп. гітлераўцы захапілі Смаленск, сав. войскі нанеслі ўдары ад Рослаўля, Белага, Ярцава, 16-я армія пры падтрымцы 20-й арміі да 27 ліп. адкінула іх да Смаленска і авалодала паўн. ускраінай горада. Амаль месяц ішлі цяжкія баі ў раёне Ельні, дзе сав. войскі 24-й арміі нанеслі паражэнне 6 герм. пяхотным і танкавай дывізіям. 21-я армія, што абараняла Гомель (гл. *Гомеля абарона 1941*), стрымлівала ворага да 21 жн. Упартыя абарончыя баі вяліся на інш. напрамках. У выніку за 2 месяцы група ням. армій «Цэнтр» прасунулася



Да арт. **Смаленская бітва 1812**. Бітва ў Смаленску 18 жніўня 1812 г. Размаляваная гравюра невядомага мастака. 2-я пал. 19 ст.

на У ад Дняпра толькі на 170—200 км і вымушана была 30 ліп. прыпыніць наступленне (упершыню за час 2-й сусв. вайны ням.-фаш. войскі перайшлі да абароны на гал. напрамку). У час С.б. нарадзілася сав. гвардыя, 23 жн. — 2 вер. кав. група ген. Л.М.*Даватара* ў раёне Белага, Дзямідава, Духаўшчыны зрабіла рэйд па тылах ворага і прычыніла яму вялікія страты. Каля 2 млн. працоўных Беларусі будавалі абарончыя рубяжы па Зах. Дзвіне, Лучосе, Дняпры, Сажы. Насельніцтва змагалася ў нар. апалчэнні, знішчальных батальёнах, атрадах самаабароны. На 1 вер. на Беларусі дзейнічала больш за 300 партыз. атрадаў, у якіх было больш за 8 тыс. чал. За гераізм у С.б. званне Героя Сав. Саюза прысвоена Ц.П.Бумажкову, ураджэнцам Беларусі А.І.*Лізюкову* і К.Н.*Осіпаву*.

Літ.: Великая Отечественная война Советского Союза, 1941—1945: Краткая история. 2 изд. М., 1970; Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны. Т. 1. Мн., 1983; Еременко А.И. На западном направлении. М., 1959; Яго ж. В начале войны. М., 1964; Пономаренко П.К. Во главе обороны // Солдатами были все. 2 изд. Мн., 1972; Советский Союз в годы Великой Отечественной войны 1941—1945. М., 1976; Черемухин К. На Смоленско-Московском стратегическом направлении летом 1941 г. // Воен.-ист. журн. 1966. № 10; История второй мировой войны, 1939—1945. Т. 4. М., 1975.

У.І.Лемяшонак.

СМАЛЁНСКАЯ ВО́БЛАСЦЬ. Размешчана на З еўрап. ч. Рас. Федэрацыі. Утворана 27.9.1937. На З і ПдЗ мяжуе з Беларуссю. Пл. 49,8 тыс. км^2. Нас. 1128 тыс. чал. (2000), гарадскога 70,1%. Цэнтр — г. *Смаленск*. Найб. гарады: Вязьма, Рослаўль, Ярцава, Сафонава, Дзеснагорск, Гагарын.

Паверхня — хвалістая раўніна, у межах якой вылучаюцца Смаленскае ўзв. (выш. да 319 м), парэзанае далінамі рэк. На ПнЗ марэнныя грады. Карысныя выкапні: буры вугаль (зах. ч. *Падмаскоўнага вугальнага басейна*), торф. фасфарыты, мергель, мел, вапнякі, гліны, пясок і інш. Клімат умерана кантынентальны. Сярэдняя т-ра студз. ад -10 °С на ПнУ да -8 °С на ПдЗ, ліп. 18 °С. Ападкаў каля 600 мм за год. Гал. р. Дняпро з прытокамі Сож, Дзясна, Воп, Вязьма і інш.; на ПнЗ — Зах. Дзвіна з прытокам Каспля, на У — Угра і Вазуза (бас. р. Волга). Больш за 150 азёр, пераважна ледавіковага паходжання. Глебы дзярнова-падзолістыя, месцамі забалочаныя, у далінах рэк алювіяльныя. Пад лесам (асіна, бяроза, елка, хвоя) каля 40% тэрыторыі. Нац. парк Смаленскае Паазер'е.

Гал. галіны прам-сці: маш.-буд. і металаапрацоўка (аўтамаб. дызельныя рухавікі і агрэгаты, энергет. і электралямпавае абсталяванне, сродкі вылічальнай тэхнікі, вымяральныя і гідраметэаралагічныя прылады, алмазныя інструменты, быт. халадзільнікі); хім. (мінер. ўгнаенні, сінт. прадукцыя, пластмасы); лёгкая (баваўняныя і льняныя тканіны, бялізнавы трыкатаж, швейныя вырабы, абутак, шпагат); харч. (малочна-кансервавая, масласыраробная, мукамольная, макаронная і інш.); лясная і дрэваапр., у т.л. мэблевая; паліграф.; ювелірная (аграньванне брыльянтаў). Вытв-сць буд. матэрыялаў (керамзіт, цэгла, шкло і інш.). Развіты паліўна-энергет. комплекс. Вытв-сць электраэнергіі 22,4 млрд. кВт·гадз (1999). Дарагабужская ДРЭС, Смаленскія АЭС і ДРЭС. Здабыча бурага вугалю і торфу. Вядучая галіна сельскай гаспадаркі — малочна-мясная жывёлагадоўля і свінагадоўля; развіта конегадоўля (рысістыя пароды),



птушкагадоўля. Пасяўныя плошчы займаюць 899 тыс. га, у т.л. пад збожжавымі культурамі (ячмень, авёс, жыта, пшаніца) 33,2% плошчы, тэхн. (лён-даўгунец) 0,7%, бульбай і агароднінай 5,8%, кармавымі 60,3%. Даўж. чыгунак 1259 км, аўтадарог з цвёрдым пакрыццём 8819 км (1999). Гал. чыгунка і аўтамагістраль Масква—Мінск, чыг. вузлы Смаленск, Вязьма, Рослаўль. Суднаходства па р. Дняпро. Газаправод Таржок—Смаленск—Івацэвічы і інш.

Беларусы ў Смаленскай вобласці. Тэр. сучаснай С.в. з часоў сярэдневякоўя з'яўляецца натуральнай часткай бел.-рас. этнічнага і культ. памежжа. Тут у 7—11 ст. жылі адны з продкаў беларусаў — смаленскія *крывічы*, якія ўтварылі *Смаленскае княства*. Некалькі стагоддзяў за смаленскія землі змагаліся Маск. дзяржава (Расія) і ВКЛ, якое з 1569 разам з Польшчай утварала Рэч Паспалітую (гл. *Паходы Вітаўта на Смаленск 1395—1404, Вайна Маскоўскай дзяржавы з Вялікім княствам Літоўскім 1512—22, Вайна Рэчы Паспалітай з Расіяй 1609—18, Вайна Расіі з Рэччу Паспалітай 1632—34, Вайна Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—67*); у 1404—1514 рэгіён уваходзіў у склад ВКЛ, у 1618—67 — Рэчы Паспалітай. Пасля далучэння да Расіі тут існавала *Смаленская губерня*, большасць насельніцтва якой складалі беларусы; у зах. Смаленшчыне, верагодна, напісана бел. ананімная паэма *«Энеіда навыварат»*. Але колькасць беларусаў у выніку этн. асіміляцыі паступова скарацілася. Уздым грамадскай і нац.-культ. актыўнасці мясц. беларусаў прыпаў на пач. 20 ст. Прадстаўнікі беларусаў Смаленшчыны ўдзельнічалі ў працы *Усебеларускага з'езда 1917*. У 1922—23 і 1925—27 дзейнічала *Беларуская секцыя пры Смаленскім губернскім аддзеле народнай асветы*, якая супрацоўнічала з Бел. студэнцкім земляцтвам у Смаленску (існавала ў 1924—29? пры Смаленскім ун-це). Са Смаленшчыны паходзілі гісторык А.*Кіркор*, дзеячы бел. культуры А.*Ружанцоў* і М.*Шчаглоў-Куліковіч*. У 1920 — пач. 1930-х г. у зах. раёнах вобласці дзейнічалі бел. школы, чырв. куткі, хаты-чытальні і інш. У канцы 1930-х г. бел. даследчыцкая і культ.-асв. дзейнасць у С.в. згорнута. У вобласці жыве 29 тыс. беларусаў (2000); бел. тэматыку вывучаюць М.М.*Ількевіч*, А.У.Корсак, Г.А.Ластоўскі і інш.

Літ.: Живописная Россия: ...Литовское и Белорусское Полесье. 2 изд. Мн., 1994 [рэпр. выд.: СПб., 1882]; Судьбы национальных меньшинств на Смоленщине, 1918—1938 гг. Смоленск, 1994; Корсак А.У. Беларускія школы на Смаленшчыне // Бел. гіст. часоп. 1998. № 3; Яго ж. Культурная работа сярод нацыянальных меншасцей Смаленшчыны ў першае дваццацігоддзе савецкай улады // Весці Нац. АН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. 2000. № 3.

У.Я.Калаткоў (беларусы ў Смаленскай вобласці).

СМАЛЁНСКАЯ ГУБЕ́РНЯ, адм.-тэр. адзінка ў Рас. імперыі і РСФСР у 1708—1929. Цэнтр — г. *Смаленск*. Смаленская зямля (гл. *Смаленскае княства*) далучана да Расіі ў выніку вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—67. У 1686 утворана Смаленскае ваяводства, у 1708 — С.г.; у 1719 скасавана, з часткі яе ўтворана Смаленская правінцыя Рыжскай губ. У 1726 С.г. адноўлена, падзялялася на паветы: Вяземскі, Гжацкі, Дарагабужскі, Ельнінскі, Касплянскі, Краснінскі, Парэцкі, Рослаўскі, Рупасоўскі, Смаленскі і Сычоўскі. У 1776 перайменавана ў Смаленскае намесніцтва. У 1796 С.г. адноўлена, падзялялася на 9 паветаў: Бельскі, Вяземскі, Гжацкі, Дарагабужскі, Парэцкі, Рослаўскі, Смаленскі, Сычоўскі, Юхнаўскі. У 1897 у С.г. насельніцтва 1 551 068 чал., пл. 49 212,2 кв. вярсты. З 1918 С.г. ў складзе БССР (акрамя Вяземскага, Гжацкага, Сычоўскага і Юхнаўскага пав.). Паводле пастаноў НКУС РСФСР ад 11.7.1919 да С.г. далучаны Мсціслаўскі пав. Гомельскай губ., ад 26.9.1919 — 4 воласці (Любавіцкая, Мікулінская, Руднянская і Хлыстоўская) Аршанскага пав. Віцебскай губ., паводле пастановы ВЦВК ад 27.7.1922 — Горацкі пав. Гомельскай губ. (акрамя Нічыпаравіцкай вол.). Паводле пастановы ЦВК СССР ад 7.3.1924 Горацкі і Мсціслаўскі пав. вернуты ў склад БССР. У 1929 С.г. скасавана ў сувязі з раянаваннем і ўтварэннем Зах. вобласці.

СМАЛЕ́НСКАЯ ХРО́НІКА, бел. гіст.-літ. твор. Напісаны ў канцы 1430-х г. у г. *Смаленск* у асяроддзі таго правасл. духавенства, дзе ўзнікла *«Пахвала Вітаўту»* і складаўся *Беларуска-літоўскі летапіс 1446*. Змешчана ў розных спісах Бел.-літ. летапісу 1446. Храналагічна ахоплівае перыяд 1430—36. Прысвечана апісанню падзей у ВКЛ пасля смерці ў 1430 вял. кн. Вітаўта, барацьбы за вялікакняжацкую ўладу паміж *Свідрыгайлам* і *Жыгімонтам Кейстутавічам*. Пачынаецца кароткім апавяданнем пра каранацыйны з'езд Вітаўта. Аўтар С.х. — прыхільнік Жыгімонта Кейстутавіча, брата Вітаўта. Падзеі ў творы выкладзены бегла, па-дзелавому суха, з выкарыстаннем традыцыйных моўна-стылявых форм і сродкаў. У 1440-я г. дапоўнена пагадовымі запісамі мясц. і агульнадзярж. характару аб падзеях 1432—46.

В.А.Чамярыцкі.

СМАЛЕ́НСКАЯ ШКО́ЛА ДО́ЙЛІДСТВА, школа стараж.-рус. культавага дойлідства 12—13 ст. ў г. *Смаленск*. Да 1180-х г. развівалася ў рэчышчы кіеўскай арх.-буд. традыцыі. З канца 12 ст. пад уплывам *Полацкай школы дойлідства* набыла новыя рысы і кампазіцыйныя схемы. У адрозненне ад полацкіх смаленскія храмы мелі звонку 2-ступеньчатыя пілястры з тонкімі паўкалонкамі, сцены паміж прытворам і малельнай залай адсутнічалі, што ўзмацняла стоўпападобнасць і верт. ўзнёсласць. Яскравы яе ўзор — 1-купальная 1-апсідная царква Міхаіла Архангела (Свірская; 1191—94, выш. ўнутры 35 м); яе высокі цэнтр. аб'ём мае 3-лопасцевае завяршэнне, барабан размешчаны на адмысловым п'едэстале. У ніжняй ч. храма пабудаваны нізкія прытворы. У выніку археал. даследаванняў (1970-я г., арх. П.А.Рапапорт) выяўлены рэшткі кампазіцыйна аналагічных храмаў царкве Архангела Міхаіла (сабор Троіцкага манастыра на Клоўцы, цэрквы Пятніцкая, Спаская і інш.). Некат. храмы мелі галерэі (цэрквы на Малой Рачаўцы, 6-слуповая на Уваскрэсенскай гары). Па інтэнсіўнасці буд. дзейнасці ў пач. 13 ст. Смаленск займаў гал. месца сярод арх.-буд. цэнтраў Русі. Смаленскія майстры пабудавалі цэрквы Спаскую ў Старой Разані, Пятніцы на Таргу ў Ноўгарадзе (1207), на Узнясенскім спуску ў Кіеве. Эпідэмія 1230, ваен. падзеі спынілі развіццё С.ш.д.

Літ.: Смоленск: [Фотоальбом]. М., 1988.

Г.А.Лаўрэцкі.

СМАЛЕ́НСКІ [Smoleński; псеўданім Грабенскі (Grabieński) Уладзіслаў; 6.4.1851, в. Грабяніцы-Малыя Мазавецкага ваяв., Польшча — 7.5.1926], польскі гісторык; прадстаўнік варшаўскай школы гістарыяграфіі ліберальна-патрыят. кірунку. Чл. Польскай АН у Кракаве (1918). Скончыў Варшаўскі ун-т (1874), у 1919—26 праф. у ім. Даследаваў праблемы цывілізацыйных змен у 18 ст., паліт. ролю варшаўскага мяшчанства, праблемы ідэалогіі, маралі і звычаяў розных сац. пластоў. У кн. «Гісторыя польскага народа» (т. 1—2, 1897—98) выступаў супраць кансерватызму і ўплыву рэлігіі, найперш каталіцызму. У працы «Гістарычныя школы ў Польшчы» (1886) акрэсліў гал. кірункі развіцця тагачаснай польскай гістарыяграфіі, крытыкаваў погляды кракаўскай школы на гісторыю Польшчы. У працах «Апошні год Вялікага сейма» (1896) і «Таргавіцкая канфедэрацыя» (1903) прааналізаваў грамадскія настроі ў Рэчы Паспалітай у 1791—93. Інш. працы: «Калантаеўская кузня» (1885), «Разумовы пераварот ў Польшчы XVIII ст.» (1891), «Гістарычныя пісьмы» (т. 1—3, 1901).

Ю.В.Бажэнаў.



Да арт. **Смаленская школа дойлідства**. Царква Міхаіла Архангела (Свірская). 1191—94.

СМАЛЕ́НСКІ КРЭМЛЬ, помнік абарончага дойлідства 16—17 ст. у г. Смаленск (Расія). Размешчаны ў старой ч. горада на Саборнай гары. Меў стратэг. значэнне на зах. рубяжах Расіі. Крапасныя сцены С.к. (1596—1602, дойлід Ф.Конь) — адно з найбуйнейшых рас. ваен.-абарончых збудаванняў (даўж. каля 6,5 км, выш. каля 10—12 м, таўшч. да 6 м), завершаны каменнымі баявымі і глухімі зубцамі, мелі 38 прамавугольных, шматгранных і круглых вежаў (захаваліся часткова). Крэпасць была абсталявана байніцамі для шмат'яруснай сістэмы агню; у спалучэнні з рэльефам мясцовасці з'яўлялася магутным заслонам для непрыяцеля. У яе афармленні выкарыстаны разнастайныя прыёмы, якія ствараюць непаўторны арх. ансамбль. Звонку сцены былі пабелены, на асобных участках пафарбаваны пад цэглу, з тыльнага боку — вял. арачныя нішы. У сярэдзіне паўн. і паўд. сцен Дняпроўская (Фролаўская) і Молахаўская гал. брамы. На тэр. крамля ўзведзены барочны 5-купальны Успенскі сабор (1677—79, арх. А.Каралькоў, перабудаваны ў 1732—40 арх. А.Шэдэлем; драўляны іканастас 1730—40, маст. С.Трусіцкі і інш.) са званіцай (1767—72), белакаменнай саборнай лесвіцай (1766—67, перабудавана ў 1784 арх. М.Сляпнёвым) і агароджай (1767), надбрамны Богаяўленскі сабор (1784, арх. Сляпнёў), будынак кансісторыі (1790, класіцызм). Абарончыя збудаванні С.к. ў стане рэстаўрацыі. Іл. гл. таксама да арт. *Смаленск*.

Г.А.Лаўрэцкі.

СМАЛЕ́НСКІ ЛЕ́ТАПІС, помнік стараж.-рус. летапісання. Складаўся ў г. *Смаленск* у 13 — пач. 15 ст. Вядомы па ўрыўках, што зберагліся ў рус. і бел. летапісных зводах 15—16 ст. Прысвечаны пераважна гісторыі Смаленскай зямлі і часткова ВКЛ (звесткі пра паход кн. Альгерда і Святаслава Смаленскага на Маскву ў 1370, пра бітву літ. і смаленскіх князёў пад Мсціславам у 1386, бітву кн. Вітаўта з татарамі на р. Ворскла ў 1399, пра вяртанне ў Смаленск кн. Юрыя Святаславіча, яго смерць у 1407 і інш.). Падзеі ў С.л. асветлены з мясц. пазіцый. Яго аўтары — патрыёты і выразнікі інтарэсаў смаленскіх феадалаў. Твор прасякнуты ідэяй сцвярджэння паліт. самастойнасці *Смаленскага княства*, у асобных месцах мае антылітоў-



Смаленскі крэмль.

скую накіраванасць. Усяго вядома каля 70 гіст. запісаў канца 13 — пач. 15 ст., звязаных са Смаленскам, аднак некаторыя з іх не смаленскага паходжання, а ўзніклі ў Маскве або Ноўгарадзе. С.л. складзены ў традыцыйнай форме як збор дзелавых пагадовых запісаў і гіст. апавяданняў, размешчаных у храналагічнай паслядоўнасці. Адна з крыніц рус. летапісаў 15 ст., у прыватнасці Троіцкага летапісу (звод Кіпрыяна 1408), і праз іх *Беларуска-літоўскага летапісу 1446*. Мясц. смаленскае летапісанне заняпала ў пач. 15 ст. ў сувязі з канчатковай стратай Смаленскім княствам паліт. незалежнасці (у 1404 увайшло ў ВКЛ). У 2-й чвэрці 15 ст. ў Смаленску вяліся гіст. запісы і ўзнік шэраг летапісных твораў (2-я частка *«Летапіса вялікіх князёў літоўскіх»*, *Смаленская хроніка* і інш.), аднак гэта помнікі не смаленскага, а агульнадзярж. бел.-літ. летапісання. *В.А.Чамярыцкі.*

СМАЛЁНСКІ ПСАЛТЫ́Р, бел. рукапісны помнік канца 14 ст. Паходзіць з Успенскага манастыра (цяпер в. Пустынкі Мсціслаўскага р-на Магілёўскай вобл.). Зроблены на пергаменце Лукой Смалянінам (Смаленцам) у 1395 па заказе манаха Аляксея. Уключае псалтыр «з наследаваннем», Евангелле ад Іаана і ўрыўкі з апостала, некалькі запісаў, выкананых тайнапісам. Аздоба складаецца з 3 мініяцюр, 22 застовак, 150 ініцыялаў з мудрагелістым плеценым арнаментам, выявамі людзей, жывёл і пачвар, а таксама сімвалічнага малюнка (леў з арлінымі крыламі, заяц, мядзведзь, крылаты барс, пачвара з чалавечай галавой паміж рагоў). Перапісчык (ён жа і афарміцель) выкарыстоўваў сінюю, зялёную, чырвоную фарбы, золата. У 1657 рукапіс паводле загаду патрыярха Нікана вывезены ў манастыр на в-ве Кій Анежскай губы Белага мора, адсюль другая яго назва — «Анежскі псалтыр». Зберагаецца ў Гіст. музеі ў Маскве.

Літ.: Бугославский Г.К. Замечательный памятник древней смоленской письменности XIV в. и имеющийся в нем рисунок символико-политического содержания // Древности: Тр. Москов. Археол. о-ва. М., 1906. Т. 21, вып. 1; Долгов С.О. Архангельская Псалтырь // Там жа. *М.В.Нікалаеў.*

«СМАЛЁНСКІЯ ГРА́МАТЫ XIII—XIV стст.» («Смоленские грамоты XIII—XIV вв.»), зборнік смаленскіх грамат 12—14 ст., выдадзены Інтам рус. мовы АН СССР у Маскве ў 1963. Апублікаваны комплекс актаў Смаленскай епархіі сярэдзіны 12 — пач. 13 ст. (паводле копій 16 ст.); дагавор пра ўмовы гандлю невядомага смаленскага князя з Рыгаю і Готскім берагам (в-аў Готланд) прыкладна 1223—25; *дагавор 1229* Смаленска з Рыгаю і Готскім берагам (6 спісаў 13—14 ст.); судовая грамата смаленскага кн. Фёдара Расціславіча пра нямецкі звон 1284; пацвярджальныя граматы князёў Фёдара Расціславіча 1284, Аляксандра Глебавіча каля 1300, Івана Аляксандравіча 1-й пал. 14 ст; грамата смаленскага кн. Юрыя Святаславіча пра саюз з каралём польскім і вял. князем ВКЛ Ягайлам 1386. Большасць грамат надрукавана з арыгіналаў. Выданне здзейснена найперш з лінгвістычнымі мэтамі з максімальным набліжэннем да арыгіналаў. Матэрыялы зборніка маюць вял. значэнне для асвятлення гісторыі Полацкай і Віцебскай зямель, якія ў 13—14 ст. мелі цесныя сувязі са Смаленскам, і гісторыі бел. мовы, бо ў смаленскіх граматах 13 ст. ўпершыню выявіліся рысы жывой бел. мовы.

СМАЛЁЎКА (Silene), род кветкавых раслін сям. гваздзіковых. Каля 200 (паводле інш. звестак 500) відаў. Пашыраны ў Паўн. паўшар'і. На Беларусі каля 10 відаў. Найб. вядомыя С.: літоўская (S. lithuanica), занесена ў Чырв. спіс Еўропы, паніклая (S. nutans), татарская (S. tatarica); заносныя — ліпкая (S. viscosa), начная (S. noctiflora). Трапляюцца ў хмызняках, узлесках, на лугах, каля дарог. Культывуецца С. паніклая, якая мае вял. колькасць садовых форм.

Адна-, двух- і шматгадовыя травяністыя расліны, радзей паўкусты. Сцёблы пераважна прамастойныя, выш. 20—80 см. Лісце суцэльнае, супраціўнае. Кветкі белыя, жаўтаватыя, чырв., пурпуровыя, у рыхлай гронцы. Для многіх відаў характэрна апыленне начнымі насякомымі, таму кветкі раскрываюцца ноччу. Плод — каробачка. Лек., меданосныя, фарбавальныя, дэкар. расліны, некат. — пустазелле. *А.М.Скуратовіч.*



Смалёўка: 1 — вілаватая; 2 — шматкветкавая.

СМАЛЁЎКІ (Pissodes), род жукоў сям. даўганосікаў. 15 відаў. Пашыраны ў хвойных лясах Еўразіі і Паўн. Амерыкі. Жывуць у драўніне (лічынкі — пад карой, некат. ў шышках). На месцы пракалаў кары застаюцца кроплі смалы (адсюль назва). На Беларусі 5 відаў С.: крапінкавая (P. notatus), стваловая (P. pini), хваёвая верхавінкавая, або хваёвая жардняковая (P. pipiphilus), шышкавая (P. validirostris), яловая (P. harcyniae).

Даўж. да 10 мм. Цела прадаўгаватае, карычневае або чырвона-бурае з жоўтымі лускаватымі плямамі і перавязямі. Кормяцца маладымі парасткамі, тонкімі ствалінкамі. Лічынкі белыя, з цёмнай галавой, бязногія, выгнутыя. Кукалкі белыя, свабодныя.

Літ.: Воронцов А.И. Лесная энтомология. 2 изд. М., 1967; Падий Н.Н. Краткий определитель вредителей леса. 3 изд. М., 1979. *С.Л.Максімава.*



Смалёўкі: 1 — крапінкавая; 2 — стваловая; 3 — шышкавая; 4 — хваёвая верхавінкавая.

СМАЛІ́ЦА, вёска ў Быхаўскім р-не Магілёўскай вобл., на аўтадарозе Быхаў — Трылесіна. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 21 км на У ад горада і 22 км ад чыг. ст. Быхаў, 54 км ад Магілёва. 546 ж., 208 двароў (2001). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка. Магіла ахвяр фашызму. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.



М.Смалухоўскі.

СМАЛІ́ЧЫ, вёска ў Бучацінскім с/с Капыльскага р-на Мінскай вобл., на р. Волка. Цэнтр. закрытага акц. т-ва «Малінава». За 42 км на Пд ад г. Капыль, 157 км ад Мінска, 34 км ад чыг. ст. Цімкавічы. 366 ж., 141 двор (2001). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі. Брацкія магілы партызан. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

СМАЛУХО́ЎСКІ, фон Смолан-Смалухоўскі (Smoluchowski) Марыян (28.5.1872, Фордэрбруль, каля Вены — 5.9.1917), польскі фізік-тэарэтык. Скончыў Венскі ун-т (1894). З 1899 у Львоўскім ун-це (з 1900 праф.). З 1913 праф. Кракаўскага ун-та (у 1917 рэктар). Навук. працы па малекулярнай фізіцы, тэрмадынаміцы, статыстычнай механіцы і малекулярна-кінетычнай тэорыі (МКТ) газаў. Распрацаваў тэорыю флуктуацый (1904) і тэорыю броўнаўскага руху (1905—06), якія пацвердзілі існаванне малекул і спрыялі станаўленню МКТ. Адкрыў з'яву скачка т-ры каля цвёрдай паверхні для разрэджаных газаў. Даў статыстычную інтэрпрэтацыю другога закона тэрмадынамікі і акрэсліў межы яго дастасавальнасці.

Тв.: Рус. пер. — Броуновское движение: Сб. статей. [М.; Л., 1936] (разам з А.Эйнштэйнам).

Літ.: Teske A. Marian Smoluchowski: Życie i twórczość. [Kraków], 1955; Краевский В. Борьба Мариана Смолуховского за научную атомистику // Вопр. философии. 1956. №4; Суворов С.Г. К 50-летию со дня смерти М.Смолуховского // Успехи физ. наук. 1967. Т. 93, вып. 4.

СМАЛЬ Іван Трафімавіч (9.10.1892, в. Ляхаўцы Маларыцкага р-на Брэсцкай вобл. — 18.7.1967), удзельнік барацьбы за сав. ўладу на Беларусі. Скончыў Ленінградскую прамысл. акадэмію (1933). З 1906 рабочы лясніцтва ў Брэсцкім пав., потым у ЗША. З 1914 у арміі, з 1915 на ваен. з-дзе ў Гомелі. У 1917 чл. Гомельскага Савета і адзін з арганізатараў Чырв. гвардыі ў Навабеліцы. З сак. 1918 чл. ініцыятыўнай пяцёркі па арганізацыі партыз. руху і падп. дзейнасці на Гомельшчыне, чл. Палескага паўстанцкага к-та. Удзельнік грамадз. вайны і ваен. інтэрвенцыі 1918—20. З 1924 на парт. і гасп. рабоце на Беларусі. У 1937 рэпрэсіраваны. Удзельнік Вял. Айч. вайны. З 1954 на Мінскім аўтазаводзе. Рэабілітаваны ў 1956. Аўтар успамінаў.

СМА́ЛЬТА (ням. Smalte, Schmalte ад schmelzen плавіць), каляровае шкло, якое выкарыстоўваецца для стварэння *мазаікі*. Бывае С. празрыстая (пры афарбоўцы шкла вогнетрывалымі фарбавальнікамі) і глухая (пры ўвядзенні ў шкляную масу двухвокісу волава, вокісу сурмы і інш. рэчываў, якія заглушаюць празрыстасць шкла). Існуюць жылістая і плямістая С., а таксама залатая і сярэбраная (дзеля гэтага паміж асн. і покрыўным слоем запрасоўваюць фольгу). Штампоўкай або расколваннем С. надаюць форму кубікаў або пласцін. Вядома з ант. часоў, яе шырока выкарыстоўвалі ў Візантыі, Італіі, Стараж. Русі. На Беларусі вытв-сць С. вядома з 11 ст. (Полацк). Шырока выкарыстоўваецца ў *манументальным мастацтве*, для аздаблення грамадскіх і культавых будынкаў.

СМАЛЬЯ́НСКІ АГРА́РНЫ КАЛЕ́ДЖ. Засн. ў 1930 у в. Агранамічная (каля чыг. ст. Смальяны Аршанскага р-на) на базе ніжэйшай школы як с.-г. тэхнікум. З 1973 саўгас-тэхнікум, з 1998 с.-г. тэхнікум, з 2001 аграрны каледж. Рыхтуе аграномаў, эканамістаў і землеўпарадчыкаў. Спецыяльнасці (2001/02 навуч. г.): эканоміка і кіраванне; аграномія; землеўпарадкаванне. Прымае асоб з базавай і сярэдняй адукацыяй. Навучанне дзённае.

СМАЛЬЯ́НЦАЎСКАЯ ПАПЯРО́ВАЯ ФА́БРЫКА «Скіна», гл. ў арт. *Чашніцкая папяровая фабрыка «Чырвоная Зорка»*.

СМАЛЯВІ́ЦКАЕ ВАДАСХО́ВІШЧА. За 2 км на ПнЗ ад г.Смалявічы Мінскай вобл. Створана ў 1978. Пл. 0,95 км^2, даўж. 1,4 км, найб. шыр. 1 км, найб. глыб. 4 м, аб'ём вады 2,4 млн. м^3. Наліўное, напаўняецца вадой з р. Пліса пры дапамозе помпавай станцыі. Ваганні ўзроўню вады на працягу года 0,3—0,6 м. Выкарыстоўваецца для арашэння с.-г. угоддзяў, рыбагадоўлі, адпачынку.

СМАЛЯВІ́ЦКАЕ ПАТРЫЯТЫ́ЧНАЕ ПАДПО́ЛЛЕ «ЧЫРВО́НЫ СЦЯГ» у Вялікую Айчынную вайну. Дзейнічала ў жн. 1941 — чэрв. 1944 у г. *Смалявічы* і раёне пад кіраўніцтвам Смалявіцкага падп. райкама КП(б)Б (з кастр. 1942). Складалася з 2 груп на торфапрадпрыемстве (53 чал., кіраўнікі А.П.Караўка, С.В.Раждзественскі, А.Л.Запольскі). Падпольшчыкі падтрымлівалі сувязь з партызанамі брыгады «Разгром» і чл. Мінскага падполля на ЦЭЦ-2, вялі агітацыю сярод насельніцтва, прымалі па радыё і распаўсюджвалі зводкі Саўінфармбюро, праводзілі дыверсіі (зрывалі вываз торфу на мінскія электрастанцыі, вывелі са строю 18 торфаздабыўных машын, электрастанцыю і інш.). Збіралі і перадавалі партызанам адзенне, зброю, харчаванне, медыкаменты, звесткі пра гарнізоны і апорныя пункты ворага. У барацьбе з фаш. захопнікамі загінулі 10 падпольшчыкаў.

Літ.: Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941—1945: Энцыкл. Мн., 1990. С. 569.

Л.В.Аржаева.

СМАЛЯВІ́ЦКІ РАЁН. Размешчаны ў цэнтр. частцы Мінскай вобл. Утвораны 17.7.1924, скасаваны 25.12.1962, адноўлены 6.1.1965. Пл. 1,4 тыс. км^2. Нас. 45,5 тыс. чал. (2001, без г. *Жодзіна*), гарадскога 33,9%. Сярэдняя шчыльн. 33 чал. на 1 км^2. Цэнтр — г. *Смалявічы*. На тэр. раёна г. *Жодзіна*. Раён уключае р.п. *Зялёны Бор*, 197 сельскіх нас. пунктаў, Зеленаборскі пасялковы Савет, 11 сельсаветаў: Азярыцкаслабодскі, Драчкаўскі, Жодзінскі, Забалоцкі, Курганскі, Пекалінскі, Плісскі, Прылепскі, Пятровіцкі, Усяжскі, Юр'еўскі.

Зах. ч. раёна ў межах *Мінскага ўзвышша*, усх. — *Цэнтральнабярэзінскай раўніны*. Паверхня ўзгорыста-раўнінная, 73% яе на выш. 180—250 м, найвыш. пункт 266 м (на ПнЗ ад в. Карпілаўка). Агульны нахіл з З на У і ПнУ. Карысныя выкапні: торф, сапрапель, пясчана-жвіровы матэрыял, буд. пяскі, гліны, суглінкі. Сярэдняя т-ра студз. -6,9 °С, ліп. 17,9 °С. Ападкаў 645 мм за год. Вегетац. перыяд 186 сут. Найб. рэкі: Гайна з прытокам Усяжа, Пліса, Уша, Волма. Азёры: Судабле, Вялікае, Малое, Связец. Вадасх. Пятровіцкае на р. Волма, Смалявіцкае, Дубраўскае, Чарніцкае. Пераважаюць глебы с.-г. угоддзяў: дзярнова-падзолістыя (69,3%), тарфяна-балотныя (15,2%), дзярнова-падзолістыя забалочаныя (12,4%). Пад лесам 33%, найб. лясны масіў вакол г.п. Зялёны Бор. Пераважаюць лясы хваёвыя, яловыя, бярозавыя, дубовыя, чорнаальховыя, трапляюцца асінавыя, шэраальховыя, штучныя насаджэнні — каля 21%, пераважна хваёвыя. Пад балотамі 0,3% тэр. раёна, найб. Гайна-Бродня, Усяж, Студзёнка, Судабле. У межах раёна заказнікі рэсп. значэння: біялагічныя *Пекалінскі*, Валмянскі; заказ-



нікі мясц. значэння: гідралагічны Гайна-Бродня, батанічныя мікразаказнікі Калюга, Каменка, Маяк. Ахоўныя тарфянікі: Падастрэўе, Радзем'е, Судабле, Чарот. Помнік прыроды мясц. значэння — парк Шыпяны.

Агульная пл. с.-г. угоддзяў 71,4 тыс. га, з іх асушаных 14,1 тыс. га. На 1.1.2002 у раёне 9 калгасаў, 2 саўгасы, 36 фермерскіх гаспадарак, эксперыментальная база «Жодзіна», Смалявіцкая бройлерная птушкафабрыка, племянныя гаспадаркі «Будагова», «Зарэчча». Сельская гаспадарка спецыялізуецца на мяса-малочнай жывёлагадоўлі, свінагадоўлі, авечкагадоўлі, птушкагадоўлі, вырошчванні збожжавых, зернебабовых, бульбаводстве, насенневодстве збожжавых і бульбы. Прадпрыемствы прам-сці: эл.-тэхн. (нізкавольтная апаратура), машынабуд. і металаапр. (буд-ва дарожных машын, нестандартныя металаканструкцыі, шасцерні для Мінскага трактарнага з-да, рамонт с.-г. тэхнікі), паліўнай (перапрацоўка торфу, брыкет, нестандартнае абсталяванне для канцэрна «Белпалівагаз»), буд. матэрыялаў (бетон і жалезабетонныя вырабы, цэгла сілікатная), камбікормавай, харч. (малочная прадукцыя, віно); райпрамкамбінат (мэбля), лясгас (нарыхтоўка драўніны). Па тэр. раёна праходзяць чыгунка і аўтамагістраль Брэст — Масква, аўтадарогі на Смілавічы, Чэрвень, Лагойск і інш. Аэрапорт Мінск-2. У раёне 22 сярэднія, 2 базавыя, 4 пач., вячэрняя, муз., маст., спарт. школы, 4 школы-садкі, ПТВ, 28 дашкольных устаноў, 31 дом культуры і клуб, 38 б-к, 2 бальніцы, паліклініка, 8 амбулаторый, 11 фельч.-ак. пунктаў, санаторый-прафілакторый «Зубраня» (в. Волма). Раённы музей смалы і рамёстваў. Помнікі архітэктуры: будынкі бровара (пач. 20 ст.) у в. Алесіна, вадзяны млын (пач. 20 ст.) у в. Высокае, царква (сярэдзіна 19 ст.) у в. Дамашаны, Козьмадзям'янаўская царква (канец 19 ст.) у в. Драчкава, Георгіеўская царква (пач. 20 ст.) у в. Забалоцце, Благавешчанскі манастыр (2-я пал. 18 — 1-я пал. 19 ст.) у в. Ляды, царква Раства Багародзіцы (1904) у в. Пліса, *Курган Славы Савецкай Арміі — вызваліцельніцы Беларусі* (1969), парк (на мяжы 19—20 ст.) у в. Шыпяны. Гіст. камень-помнік у гонар аграномічнай школы Д.Манюшкі (19 ст.) у в. Алесіна. Выдаецца газ. «Край Смалявіцкі». *Р.Р.Паўлавец, І.В.Радзюк.*

СМАЛЯВІ́ЦКІ ШКЛОЗАВО́Д «Віктарыя». Дзейнічаў у 1909—15 у мяст. Смалявічы Барысаўскага пав. (цяпер. г. Смалявічы Мінскай вобл.). Выпускаў ліставое шкло, бутэлькі. У 1910 працавала 160, у 1913 —95 рабочых.

СМАЛЯВІ́ЦКІЯ ЛЕСАПІ́ЛЬНЫЯ ПРАДПРЫЕ́МСТВЫ. Дзейнічалі 2 фабрыкі: лесапільная і дрэваапрацоўчая (1894—1914), лесапільная і мукамольная (1890—1910) і мануфактура (1895—1902) у мяст. Смалявічы Барысаўскага пав. (цяпер г. Смалявічы Мінскай вобл.). Выраблялі дошкі, шавецкія шпількі, муку і крупы. Мелі паравыя машыны і паравыя катлы. Працавалі ў 1899—1900 ад 40 (на мануфактуры) да 68 чал. (на фабрыках).

СМАЛЯВІ́ЧЫ, горад, цэнтр Смалявіцкага р-на Мінскай вобл., на р. Пліса. Чыг. ст. на лініі Мінск—Орша. Аўтадарогамі злучаны з Чэрвенем, Лагойскам, Смілавічамі, Самахвалавічамі. За 55 км на У ад Мінска. 14 тыс. ж. (2001).

Вядомы з 1448 як уласнасць крэўскага намесніка Алёхны Дарагевіча. У 1508 мястэчка Мінскага ваяв. ВКЛ, уласнасць кн. К.Астрожскага, з 2-й пал. 16 ст. — Радзівілаў, Вітгенштэйнаў, Гагенлоэ. С. пацярпелі ў вайну Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—67, у Паўночную вайну 1700—21. З 1793 у Рас. імперыі, з 1795 цэнтр воласці Барысаўскага пав. У пач. 19 ст. тут існаваў княжацкі палац (згарэў у 1819). У 1871 каля С. пабудавана станцыя Вітгенштэйнаўская на пракладзенай чыгункі Масква—Брэст. У 1897 у мястэчку 2757 ж., 299 двароў, вал. ўправа, земскае нар. вучылішча (з 1863), 2 царквы, капліца, паштова-тэлегр. аддзяленне, бровар, рамесныя майстэрні па вырабе адзення і абутку, 8 кузняў. У пач. 20 ст. адбыліся забастоўкі рабочых і сял. хваляванні. З 17.7.1924 цэнтр Смалявіцкага р-на, да 24.9.1926 — сельсавета Мінскай акр. З 27.9.1938 гар. пасёлак. У 1939 — 6,8 тыс. ж. 26.6.1941 акупіраваны нямецкімі фашыстамі, якія загубілі тут больш за 2 тыс. жыхароў, у створаным гета расстралялі каля 3 тыс. ахвяр; дзейнічала *Смалявіцкае патрыятычнае падполле «Чырвоны Сцяг»*. Вызвалены 2.7.1944 войскамі 3-га Бел. фронту ў ходзе *Мінскай аперацыі 1944*. У 1962—65 у Мінскім р-не. З 7.3.1968 горад, у 1998 атрымаў герб.

Працуюць заводы: шасцерняў, жалезабетонных вырабаў, мех., малочны, хлебазавод, камбінаты харч. і каап. прам-сці, лясгас, буд. і маш.-буд. прадпрыемствы; ПТВ, 3 сярэднія, муз. і спарт. школы, Дом культуры, Дом нар. творчасці, кінатэатр, бальніца. Брацкія магілы сав. воінаў і партызан. Помнікі: сав. воінам-вызваліцелям, лётчыкам, супрацоўнікам міліцыі. *Т.Ю.Шчурко.*

СМАЛЯ́К Віктар Мікалаевіч (н. 20.4.1947, г. Рэчыца Гомельскай вобл.), бел. мастак-плакатыст. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1978). У 1980—83 выкладаў у БПІ. Працуе ў жанрах паліт., тэатр., рэкламнага плаката, якім уласцівы сінтэз выявы і шрыфту, лаканізм выразных сродкаў, эфектнае супастаўленне вобразаў. Аўтар плакатаў «Кветка шчасця» (1978), «Альпійская балада» (1980), «В.К.Бялыніцкі-Біруля» (1986), «Жывапіс і скульптура», «Графіка», «Народнае мастацтва» (усе 1986), «Курган» (1987), «Міраж» (1999), трыпціха «За мірны космас» (1985), тэатр. плакатаў для Дзярж. маладзёжнага т-ра Беларусі (з 2000). *Л.Дз.Налівайка.*



А.Я.**Смалякоў**.

СМАЛЯ́К Леанід Пятровіч (8.6.1923, в. Асобіна Буда-Кашалёўскага р-на Гомельскай вобл. — 28.3.1995), бел. вучоны ў галіне геабатанікі. Д-р біял. н. (1968), праф. (1979). Скончыў Бел. тэхнал. ін-т (1948). З 1950 у Ін-це лесу АН Беларусі, з 1956 у БелНДІ лясной гаспадаркі (нам. дырэктара), з 1971 у Ін-це эксперым. батанікі АН Беларусі (заг. лабараторыі), у 1977—90 у Бел. тэхнал. ін-це (1977—79 заг. кафедры). Навук. працы па гідралесамеліярацыі, лясным балотазнаўстве, лесаводстве, экалогіі раслін. Дзярж. прэмія Беларусі 1972.

Тв.: Эколого-физиологические основы мелиорации почв агрофитоценозов. Мн., 1974 (разам з У.Р.Рэуцкім); Ведение лесного хозяйства на осушенных землях. М., 1984 (разам з В.А.Іпацьевым, І.К.Блінцовым).

У.Р.Рэуцкі.

СМАЛЯКО́Ў Абрам Яфімавіч (29.5.1908, г. Крычаў Магілёўскай вобл. — 3.10.1943), Герой Сав. Саюза (1943). Скончыў курсы ВПШ, потым на парт. рабоце ў Ташкенце (Узбекістан). У Чырв. Арміі з 1930. У Вял. Айч. вайну з 1941 на Варонежскім фронце, удзельнік Курскай бітвы 1943. Нам. камандзіра процітанк. артыл. палка па паліт. частцы маёр



Горад **Смалявічы**. Цэнтральная плошча.

С. вызначыўся ў баях за Дняпро каля г. Канеў (Украіна): 30.9.1943 умела арганізаваў фарсіраванне Дняпра, асабістым прыкладам натхняў артылерыстаў на адбіццё атак ворага; загінуў у гэтым баі.

СМАЛЯКО́Ў Юрый Цімафеевіч (н. 20.9.1941, с. Новая Калітва Расашанскага р-на Варонежскай вобл., Расія), бел. спартсмен (фехтаванне на шпагах). Майстар спорту СССР міжнар. класа (1966). Канд. пед. навук (1977). Скончыў Бел. ін-т фіз. культуры (1963), з 1973 заг. кафедры ў ім. З 1977 нач. вучэбна-спарт. аддзела Бел. савета фізкультурна-спарт. т-ва «Дынама», у 1981—93 нач. кафедры Вышэйшай школы міліцыі. Сярэбраны прызёр XIX Алімп. гульняў (1968, Мехіка) у камандным заліку. Сярэбраны прызёр чэмпіянатаў свету ў асабістым (1965) і бронз. прызёр у камандным (1966, 1970) заліках. Чэмпіён СССР у асабістым (1966) і камандным (1961, 1964, 1966, 1968, 1972) заліках.

СМАЛЯ́НКА, смолка (Melandrium), род кветкавых раслін сям. гваздзіковых. Каля 100 відаў. Пашыраны ўсюды. На Беларусі 2 віды С.: белая (M. album), нар. назвы панчошнік, светнік, трапляецца часта ў пасевах, каля жылля, і двухдомная (M.dioicum), нар. назва шчаўкушкі, расце па хмызняках і ярах.

Адна-, двух-, і шматгадовыя травяністыя расліны выш. да 1 м з залозістым або простым апушэннем. Лісце супраціўнае, суцэльнае, прыкаранёвае звужана ў чаранок, сцябловае — сядзячае. Кветкі белыя, чырв., светла-пурпурныя ў паўпарасоніках. Плод — каробачка. Лек., дэкар. расліны, некат. пустазелле.

А.М.Скуратовіч.



Смалянка белая.

СМАЛЯ́НСКАЕ ПАТРЫЯТЫ́ЧНАЕ ПАДПО́ЛЛЕ ў Вялікую Айчынную вайну. Дзейнічала ў ліп. 1941 — чэрв. 1944 у в. *Смаляны* Аршанскага р-на Віцебскай вобл., з чэрв. 1943 дзейнічала пад кіраўніцтвам Аршанскага падп. райкама КП(б)Б; састаўная частка *Аршанскага патрыятычнага падполля*. Аб'ядноўвала 16 чал. (кіраўнік Л.І.Красноўскі). Падпольшчыкі вялі агітработу сярод насельніцтва, прымалі па радыё і распаўсюджвалі зводкі Саўінфармбюро, збіралі і перадавалі партызанам звесткі пра падрыхтоўку акупантамі карных аперацый. За час дзеяння загінулі 10 падпольшчыкаў.

Літ.: Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941—1945: Энцыкл. Мн., 1990. С. 569.



Смалянскі замак. Малюнак Ю.Пешкі канца 18 ст.

СМАЛЯ́НСКАЯ СПІРТААЧЫШЧА́ЛЬНАЯ ФА́БРЫКА. Дзейнічала ў 1895—1914 у мяст. Смаляны (цяпер вёска ў Аршанскім р-не Віцебскай вобл.). Мела паравыя машыны. У 1895 выдаткавана 31 тыс. пудоў жыта, 46 тыс. пудоў ячменю, 11 293 тыс. пудоў бульбы. У 1913 працавала 55 рабочых, выраблена 3 млн. градусаў спірту.

СМАЛЯ́НСКІ Аляксандр Аляксандравіч (13.8.1934, б. зернесаўгас «Кастрычнік» Беразнегавацкага р-на Мікалаеўскай вобл., Украіна — 17.9.1998), бел. харэограф, педагог. Засл. арт. Беларусі (1983). Скончыў Кіеўскае харэагр. вучылішча (1955). З 1955 артыст балета Данецкага, саліст і педагог-рэпетытар Малдаўскага т-раў оперы і балета, педагог Малд. харэагр. вучылішча. З 1964 балетмайстар-рэпетытар, педагог-рэпетытар, заг. балетнай трупы Нац. акад. т-ра балета Беларусі. На бел. сцэне ўдзельнічаў у пастаноўцы балетаў бел. кампазітараў «Альпійская балада», «Выбранніца», «Тыль Уленшпігель» Я.Глебава, «Пасля балю» Г.Вагнера, класічных і сучасных балетных спектакляў «Лебядзінае возера», «Шчаўкунок» П.Чайкоўскага, «Папялушка», «Рамэо і Джульета» С.Пракоф'ева, «Бахчысарайскі фантан» Б.Асаф'ева, «Сільфіда» Х.Левенскольда, «Чыпаліна» К.Хачатурана, «Стварэнне свету» А.Пятрова, «Спартак» А.Хачатурана, «Кармэн-сюіта» Ж.Бізэ — Р.Шчадрына, вак.-харэагр. прадстаўлення «Карміна Бурана» на музыку К.Орфа, «Балеро» М.Равеля.

Л.І.Брандабоўская.

СМАЛЯ́НСКІ ЗА́МАК, помнік архітэктуры 1-й чвэрці 17 ст. на паўн.-зах. ускраіне в.*Смаляны* Аршанскага р-на Віцебскай вобл. Вядомы таксама пад назвамі «Белы Ковель» ці «Малы Ковель». Займаў прамавугольную ў плане пляцоўку (100 х 200 м) на правым беразе р. Дзярноўка. Пабудаваны да 1626 кн. С.А.Сангушкам-Ковельскім. Змураваны з буйной цэглы (29 х 13 х 8 см) і палявога каменю. Меў выгляд замкнутага прамавугольніка з унутр. дваром, вуглавымі 3-яруснымі вежамі і 5-яруснай 5-граннай вежай на паўн.-ўсх. фасаднай сцяне. 3-павярховы корпус палаца па перыметры двара меў сцены таўшчынёй 1,2—1,7 м. Муроўка замка паводле тыпу найбольш блізкая да т.зв. галандскай. 5-ярусная вежа вылучаецца вытанчаным рэльефным дэкорам, які мякка кантраставаў з гладкай паверхняй сцен. Арнамент аконных праёмаў і плоская ордэрная раскрапоўка вежаў сведчаць пра стылістычную сувязь з зах.-еўрап. архітэктурай. У матывах складанага рэнесансавага абрамлення рамкі-картуша прасочваюцца галан-



Руіны вежы **Смалянскага замка**. Сучасны выгляд.

дскія ўплывы. Захаваліся сляды вітых усходаў, што ішлі па ўнутр. перыметры вежы, шмат ніш рознага памеру, арачны пераход з гал. корпуса ў вежу, дэталі камінаў. Ёсць звесткі, што на схіле жыцця гаспадар замка кн. Сангушка-Ковельскі загадаў размаляваць пакоі карцінамі на рэліг. сюжэты, тэмы смерці і забыцця. З інвентароў замка за 1739 і 1742, калі ён належаў маршалку ВКЛ П.Л.Сангушку, вынікае, што «... замак мураваны на капцы» быў наўкола «вадою абвіты». Перад ім знаходзіўся стаў з мостам. Пры ўваходзе на дзядзінец, злева, быў вял. склеп. У пакоях стаялі печы з белай кафлі з гербам «Пагоня». Дапаможныя гасп. службы размяшчаліся не ў замку, а за ставам. Замак быў разбураны ў вайну Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—67 і Паўн. вайну 1700—21. Заняпад С.з. пачаўся з канца 18 ст. і завяршыўся ў сярэдзіне 19 ст. (новы гаспадар Смалян сенатар Сямёнаў прадаў замак на цэглу). Захаваліся 5-ярусная вежа і рэшткі сцен.

Літ.: Ткачоў М.А. Замкі Беларусі (XIII—XVII ст.). Мн., 1977. С. 58—59; Бараўы Р.В. Да гісторыі замка ў Смалянах // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1971. № 3. *М.А.Ткачоў.*

СМАЛЯ́НЫ, вёска ў Аршанскім р-не Віцебскай вобл., на р. Дзярноўка, каля аўтадарогі Орша—Лепель. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 25 км на ПнЗ ад г. Орша, 100 км ад Віцебска, 6 км ад чыг. ст. Смальяны. 646 ж., 291 двор (2001). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, амбулаторыя, аптэка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан. Магіла ахвяр фашызму (за 2 км на У ад С.). Магіла Т.*Зана*. Помнікі архітэктуры: касцёл Найсвяцейшай Дзевы Марыі і кляштар дамініканцаў (1678—80), руіны Смалянскага замка, Аляксееўская царква (1864), Спаса-Праабражэнская царква (2-я пал. 18 ст.).

У пісьмовых крыніцах упершыню згадваюцца пад 1484 як маёнтак у Аршанскім намесніцтве (з 16 ст. ў Аршанскім пав. Віцебскага ваяв.), уладанне кн. С.І.Бельскага. Пазней належалі жонцы вял. кн. ВКЛ Аляксандра Алене Іванаўне, Астрожскім, вял. кн. ВКЛ Жыгімонту І Старому, яго жонцы Боне Сфорца, Сангушкам. У 1-й чвэрці 17 ст. ў С. пабудаваны *Смалянскі замак*. З 1678 мястэчка. З 1772 у Рас. імперыі, цэнтр воласці Аршанскага пав. У 1880 у С. 2315 ж., 252 дамы, 55 крам, 4 царквы, касцёл, 4 малітоўныя дамы, сінагога. З 1919 — цэнтр воласці Аршанскага пав. РСФСР. З 1924 — цэнтр сельсавета Аршанскага р-на, у жн. 1924 — вер. 1926 — *Коханаўскага раёна* Аршанскай акр. БССР. З 1938 вёска, цэнтр сельсавета Аршанскага р-на Віцебскай вобл. У Вял. Айч. вайну дзейнічала *Смалянскае патрыятычнае падполле*, ням.-фаш. захопнікі 5.4.1942 расстралялі ў С. 600 жыхароў.

Літ.: Асіноўскі С. Смаляны // Бел. мінуўшчына. 1995. № 1.

СМАЛЯ́НЫ, вёска ў Пружанскім р-не Брэсцкай вобл. Цэнтр сельсавета. За 8 км на У ад г. Пружаны, 93 км ад Брэста, 16 км ад чыг. ст. Аранчыцы. 191 ж., 79 двароў (2001). Аддз. Аранчыцкай птушкафабрыкі. Клуб, б-ка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і ахвяр фашызму.

СМАЛЯНЫ́ КА́МЕНЬ, пехштэйн, разнавіднасць *вулканічнага шкла*. Колер чорны, чырванаваты, светла-зялёны. Мае 8—10% вады, *мікраліты*, радзей украпанікі. Адрозніваюць С.к. ліпарытавыя, трахітавыя, дыябазавыя і фаналітавыя. Пры награвanні да высокіх тэмператур са С.к. вылучаюцца газы. Выкарыстоўваецца для атрымання ўспучанага *перліту*. Трапляецца ў вулканічных абласцях.



Ф.А.**Смалячкоў**.

СМАЛЯНЫ́Я КІСЛО́ТЫ, прыродныя карбонавыя к-ты, якія прадуцыруюцца раслінамі хвойных парод; асн. кампанент *жывіцы* (62—65%), *талавáга масла* (30—45%) і прадукту іх перапрацоўкі *каніфолі* (60—92%).

Сярод С.к. найб. пашыраны ненасычаныя трыцыклічныя карбонавыя к-ты агульнай ф-лы $C_{19}H_{29}COOH$, якія адрозніваюцца пазіцыяй падвойных сувязей у малекулах, а таксама іх дыгідра-, тэтрагідра- і дэгідравытворныя ($C_{19}H_{31}COOH$, $C_{19}H_{33}COOH$ і $C_{19}H_{27}COOH$ адпаведна). У жывіцы хвойных дрэў пераважаюць к-ты абіяцінавая (у жывіцы піхты яе 46—52%, кедра 32% па масе) і левапімаравая (27—36% у жывіцы хвоі). Індывід С.к. — бясколерныя крышталі без паху, добра растваральныя ў ацэтоне, бензоле, дыэтылавым эфіры, не растваральныя ў вадзе. Для С.к. характэрныя рэакцыі з удзелам карбаксільнай групы (утвараюцца солі і эфіры) і па падвойных сувязях. С.к. са спалучанымі падвойнымі сувязямі лёгка акісляюцца ў паветры і ізамерызуюцца адна ў другую (першасны кампанент жывіцы — левапімаравая к-та лёгка пераходзіць у абіяцінавую). У прам-сці атрымліваюць і выкарыстоўваюць у выглядзе каніфолі. *Я.Г.Міляшкевіч.*



Структурныя формулы **смаляных кіслот**: *а* — абіяцінавай; *б* — левапімаравай.

СМАЛЯ́РНЯ, назва р. *Жорнаўка* ў верхнім цячэнні.

СМАЛЯЧКО́Ў Фядосій Арцёмавіч (1923, в. Падгор'е Быхаўскага р-на Магілёўскай вобл. — 15.1.1942), Герой Сав. Саюза (1942). У Вял. Айч. вайну з ліп. 1941 у дывізіі нар. апалчэння Ленінграда, снайпер на Ленінградскім фронце. Знішчыў 125 гітлераўцаў, падрыхтаваў 10 снайпераў. Загінуў у баі. У в. Варанічно Быхаўскага р-на, на радзіме і ў С.-Пецярбургу С. пастаўлены помнікі.

СМА́НЦАР Анатоль Пятровіч (н. 4.5.1933, в. Лабачыха Барысаўскага р-на Мінскай вобл.), бел. вучоны ў галіне педагогікі. Д-р пед. н. (1992), праф. (1994). Засл. дз. нав. Беларусі (1998). Скончыў Мінскі пед. ін-т (1960). З 1954 настаўнічаў, з 1964 у БДУ (у 1994—99 заг. кафедры). Даследуе праблемы навучання і выхавання моладзі, падрыхтоўкі і развіцця творчага патэнцыялу настаўнікаў, гуманізацыі пед. працэсу у сярэдняй школе, гуманітарызацыі школьнай матэм. адукацыі і інш. Аўтар вучэбна-метадычных дапаможнікаў для ВНУ і сярэдняй школы, адзін з аўтараў канцэпцыі бесперапыннай пед. адукацыі (1991).

Тв.: Воспитание у школьников интереса к учению. Мн., 1987 (разам з М.А.Беразовіным); Самооценка и оценка подготовленности первокурсников к продолжению образования в вузе // Педагогика высшей и средней специальной школы. Мн., 1991. Вып. 5; Педагогические основы преемственности в обучении школьников и студентов: теория и практика. Мн., 1995; Гуманизация педагогического процесса в современной школе: история и современность. Мн., 2001 (разам з Л.В.Кандрашовай).

СМАРА́ГД, другая назва мінералу *ізумруд*.

СМАРГА́НЕЦ (Holcus), род кветкавых раслін сям. метлюжковых (злакавых). 8 відаў. Пашыраны ў Еўропе, Пярэдняй



Смарганец шарсцісты.

Азіі, Афрыцы. На Беларусі 2 віды: мяккі (H.mollis) і шарсцісты (H.lanatus). Трапляюцца на лугах, сярод хмызняку.

Шматгадовыя травяністыя расліны выш. да 1 м, часам утвараюць дзярніну. Сцёблы прамастойныя. Лісце лінейнае ці лінейна-ланцэтнае. Суквецце — падоўжаная густая мяцёлка. Плод — зярняўка. Кармавыя расліны, выкарыстоўваюцца для замацавання пяскоў.

А.М.Скуратовіч.

«СМАРГО́НСКАЯ АКАДЭ́МІЯ», жартоўная назва промыслу лавіць і дрэсіраваць мядзведзяў, заснаванага князямі Радзівіламі ў г. Смаргонь Гродзенскай вобл.; адна са школ бел. *скамарохаў*. Промысел існаваў з 17 ст. да пач. 19 ст. Маладых мядзведзяў спачатку вучылі танцаваць, для чаго іх саджалі (па 2—3) у спец. клетку, падагравалі ў ёй дно і прывучалі стаяць на задніх лапах і пераступаць з адной на другую пад удары бубна, потым вучылі барукацца, кланяцца. Сцэна з дрэсіраваным мядзведзем адлюстравана і ў *батлейцы*: выводзілі лялек — скамароха і мядзведзя, якіх называлі «смаргонскі вучыцель з вучнем» (1902, Міншчына).

СМАРГО́НСКІ ЗАВО́Д АПТЫ́ЧНАГА СТАНКАБУДАВА́ННЯ. Будаўніцтва з-да пачата ў 1970 у г. Смаргонь як прыладабудаўнічага філіяла Мінскага мех. з-да імя Вавілава. У 1972 здадзена ў эксплуатацыю 1-я чарга прадпрыемства. З 1975 сучасная назва. У 1993 далучаны Астравецкі з-д «Радыёдэталь». Уключае 9 даччыных прадпрыемстваў (1 у Мінску, 8 у г. Смаргонь). Асн. прадукцыя (2002): вакуумныя і каўцюбінгавыя ўстаноўкі, этыкетыравальныя аўтаматы, масляныя помпы для с.-г. тэхнікі і інш.

СМАРГО́НСКІ ЗАВО́Д СУХО́ГА АБЯСТЛУ́ШЧАНАГА МАЛАКА́. Пабудаваны ў 1973—76 у г. Смаргонь. З 1996 — адкрытае акц. т-ва «Смаргонскія малочныя прадукты». Асн. прадукцыя (2002): сухое абястлушчанае малако, жывёльнае масла, цэльнамалочная прадукцыя, абястлушчаны тварог, сыркі, мяккія тлустыя сыры («Клінковы», «Нёманскі», «Світанак»), марожанае.

СМАРГО́НСКІ КА́ЛЬВІНСКІ ЗБОР, помнік архітэктуры рэнесансу ў г. Смаргонь Гродзенскай вобл. У 1503 ці 1505 тут пабудаваны драўляны касцёл святых Міхаіла і Аляксея па фундацыі магната Ю.Зяновіча. У 1552 ці 1553 на яго месцы ўзведзены мураваны кальвінскі збор. У 1621 гэты храм вернуты каталікам пад назвай Троіцкі касцёл. У 1866—1921 дзейнічаў як Міхайлаўская царква, у 1921—47 — зноў касцёл. З 1947 не дзейнічаў. Рэстаўрыраваны ў 1858 і 1926. Купальны храм цэнтрычнага тыпу, у плане 8-граннік, злёгку выцягнуты па падоўжнай восі. З боку гал. фасада да яго прымыкае шмат'ярусная вежа-званіца (захаваліся 2 ярусы), завершаная нізкім шатром на 8-гранным барабане. У месцы злучэння званіцы і асн. аб'ёму прыбудавана цыліндрычная вежа. Магутныя сцены будынка прарэзаны паўцыркульнымі аконнымі праёмамі. Пластычны парапет апрацаваны лапаткамі і рэнесансавай аркатурай з гіркамі. Пасля рэстаўрацыі 1970 (Спец. навукова-рэстаўрацыйныя майстэрні, арх. В.Сахно, С.Друшчыц) тут была выставачная зала. З пач. 1990-х г. пераабсталяваны пад касцёл.

Н.Е.Маркава, А.А.Міцянін.



Смаргонскі кальвінскі збор.

СМАРГО́НСКІ РАЁН. Размешчаны на ПнУ Гродзенскай вобл. Утвораны 15.1.1940 (у сучасных межах з 15.5.1978). Пл. 1,5 тыс. км^2. Нас. 60,9 тыс. чал. (2001), гарадскога 60,3%. Сярэдняя шчыльн. 41 чал. на 1 км^2. Цэнтр — г. *Смаргонь*. Уключае 324 сельскія нас. пункты, 12 сельсаветаў: Ардашынскі, Бялкоўшчынскі, Вішнеўскі, Войстамскі, Жодзішкаўскі, Залескі, Каранёўскі, Крэўскі, Кушлянскі, Лылойцінскі, Сінькоўскі, Сольскі.



Большая ч. тэрыторыі ў межах *Нарачана-Вілейскай нізіны*, паўд. ч. на *Ашмянскім узвышшы*. Паверхня пераважна плоскараўнінная, на Пд — узгорыста-градавая, 30% яе вышэй за 200 м, 43% на выш. 140—200 м, 27% — ніжэй за 140 м. Найвыш. пункт *Мілідаўская гара* (320 м). Агульны нахіл з Пд на Пн. Глыбіня расчлянення рэльефу на Пд да 35 м/км^2. Карысныя выкапні: торф, пясчана-жвіровы матэрыял, буд. пяскі, гліны і суглінкі для грубай керамікі. Сярэдняя т-ра студз. -6,2 °С, ліп. 17,9 °С. Ападкаў 600 мм. Вегетац. перыяд 189 сут. Найб. р. Вілія з прытокамі Ашмянка, Оксна з Гервяткай, Палавойка і інш. Азёры: Рыжае, Тушча, на мяжы з Мядзельскім р-нам Свір, Вішнеўскае. Рачунскае водасх. на р. Ашмянка. Пераважаюць глебы с.-г. угоддзяў: дзярнова-падзолістыя (53,6%), дзярнова-падзолістыя забалочаныя (22,4%), дзярновыя і дзярнова-карбанатныя забалочаныя (12,7%). Пад лесам 38% тэр., найб. лясны масіў на левабярэжжы р. Вілія на Пн ад г. Смаргонь. Лясы хваёвыя, яловыя, бярозавыя, дубовыя, альховыя; штучныя насаджэнні — каля 19%, пераважна хваёвыя. Пад балотамі 2,7% тэр. раёна. У межах раёна заказнік рэсп. значэння біял. *Дубатоўскае*, заказнікі мясц. значэння: ландшафтны і біял. Блакітныя Азёры (6 азёраў без назваў), біял. Жодзішкаўскі, ландшафтны, геолага-геамарфалагічны і палеанталагічны Трылесіна, ландшафтны і геамарфалагічны Марцішкі. Помнікі прыроды рэсп. значэння: парк Залессе, валуны: каля в. Вавукі, *Камень Багушэвіча* каля в. Кушляны, *«Асілак»* у Трылесінскім лясніцтве, *Камень-горка* каля в. Укропенка, Вялікі камень каля вёсак Асаны, Крэва, Полтараўшчына; Ашмянец, Камяніцкі каля в. Камяніца, Кашэчы камень каля в. Кеўлы, Казіны камень каля в. Ядвігава, града Свайгінская каля в. Свайгіні, узгорак Мілідаўская гара каля в. Мілідаўшчына. Помнікі прыроды мясц. значэння: парк у в. Дабраўляны, валуны Марцішкінскі каля в. Бярозы, Чортаў камень каля в. Войневічы, Войстамскі і Юрыздыцкі каля в. Войстам, Вялікі камень каля в. Суцькава і валуны каля вёсак Будзілкі, Вугляны, Кацярынава, Крыўск, Мілідаўшчына, Пільці, Паляны, Сялец, Хведзевічы.

Агульная пл. с.-г. угоддзяў 55,3 тыс. га, з іх асушаных 23,1 тыс. га. На 1.1.2002 у раёне 11 калгасаў, 2 саўгасы, аграфірма «Вілія», птушкафабрыка, рыбгас, 30 фермерскіх гаспадарак. Сельская гаспадарка спецыялізуецца на мяса-малочнай жывёлагадоўлі, свінагадоўлі, птушкагадоўлі, рыбагадоўлі, ільнаводстве, вырошчванні збожжавых і кармавых культур, бульбы. Прадпрыемствы прам-сці: буд. матэрыялаў, металаапр., харч., дрэваапр., камбікормавай, першаснай апрацоўкі лёну, кааператыўнай; лясгас. Па тэр. раёна праходзяць чыгунка і аўтастрада Мінск—Вільнюс, аўтадарогі на Свір, Ашмяны, Гальшаны, Маладзечна і інш. У раёне 17 сярэдніх (у т.л. гімназія, сац.-пед. комплекс, школа-інтэрнат), 13 базавых, 6 пач., 2 спарт. школы, школа мастацтваў, ПТВ, Дом творчасці дзяцей і моладзі, станцыя дзіцяча-юнацкага турызму і краязнаўства, станцыя дзіцячай тэхн. творчасці, экалагічны цэнтр, сац.-пед. цэнтр, вучэбна-вытв. камбінат і інш., 24 дашкольныя ўстановы, 31 дом культуры і клуб, 39 б-к, 6 бальніц, 2 паліклінікі (2 філіялы), дзіцячая кансультацыя (2 фі-

ліялы), 24 фельч.-ак. пункты, цэнтр гігіены і эпідэміялогіі. Музеі: Смаргонскі гісторыка-краязнаўчы музей, *Багушэвіча Ф.К. літаратурна-мемарыяльны музей-сядзіба*, музей-сядзіба М.К.Агінскага ў в. Залессе. Помнікі архітэктуры: капліца (19 ст.) у в. Алянец, касцёл Тадэвуша (1811) у в. Вішнева, касцёл (пач. 20 ст.) у в. Войстам, царква (19 ст.) у в. Выгаліненты, Троіцкі касцёл (1809) у в. Данюшава, *Жодзішкаўскі кальвінскі збор*, сядзіба (19 ст.), якая ўключае сядзібны дом (былы *Жодзішкаўскі езуіцкі калегіум*) у в. Жодзішкі, *Залескі палацава-паркавы ансамбль*, царква Усіх засмучаных (1862) у в. Кеўлы, руіны замка (гл. *Крэўскі замак*) і царква Аляксандра Неўскага (1854) у в. Крэва, свіран (19 ст.) у в. Кушляны, Пакроўская царква (1866) у в. Міхневічы, касцёл (1905) у в. Нястанішкі, касцёл Маці Боскай (пач. 20 ст.) у в. Солы. Гіст. помнік — цэнтр рамяства (19 ст. — 1-я пал. 20 ст.), адзін з буйнейшых цэнтраў керамічнай вытв-сці на З Беларусі ў в. Крэва. Выдаецца газ. «Светлы шлях».

В.І.Мацкевіч, Р.Р.Паўлавец.



Горад **Смаргонь**. Вуліца Савецкая.

СМАРГО́НСКІЯ ГАРБА́РНЫЯ ПРАДПРЫЕ́МСТВЫ. У 1839—1914 у мяст. Смаргонь (цяпер горад у Гродзенскай вобл.) дзейнічалі 3 мануфактуры і фабрыка. Выраблялі конскія і інш. скуры, гамбургскі тавар, шчыгрын, халявы, саюзкі, чаравікі і інш. Мелі паравыя рухавікі. На прадпрыемствах працавалі ад 50 да 93 рабочых.

СМАРГО́НЬ, горад абл. падпарадкавання, цэнтр Смаргонскага р-на Гродзенскай вобл., на р. Оксна (левы прыток р. Вілія) і яе прытоку р. Гервятка. Чыг. ст. на лініі Маладзечна—Вільнюс, вузел аўтадарог на Маладзечна, Вільнюс, Крэва, Свір. За 260 км на ПнУ ад Гродна. 36,7 тыс. ж. (2001).

Вядома з 15 ст. ў ВКЛ як прыватнае мястэчка Зяновічаў, з 1-й пал. 17 ст. — Радзівілаў, Пшаздзецкіх. Мела таксама назвы Смургоні, у 19 ст. — Смаргоні. Каля 1590 у С. засн. папяровая мануфактура, школа, шпіталь. У 1622 у С. 139, у 1640 — 155 домаўласнікаў, 20% жыхароў займаліся рамяством. У 17 ст. Радзівілы заснавалі тут школу дрэсіроўкі мядзведзяў — *«Смаргонскую акадэмію»*. У 1788 у С. 3 фальваркі, 393 двары, 3 бровары, 3 млыны, 2 прадпрыемствы па выпуску буд. матэрыялаў, гарбарня. Пасля 3-га падзелу Рэчы Паспалітай (1795) у Рас. імперыі, у Ашмянскім пав. Віленскай губ. (з 2-й пал. 19 ст. цэнтр воласці). У вайну 1812 пры адступленні франц. войск у С. спыняўся імператар Напалеон, тут ён перадаў камандаванне арміяй маршалу І.Мюрату. У 19 ст. — пач. 20 ст. С. — цэнтр гарбарнай і швейнай прам-сці Беларусі. Развіццю мястэчка спрыяла буд-ва Лібава-Роменскай чыгункі (1873). У 1897 — 7,5 тыс. ж., у 1900 — 10,2 тыс. ж., пошта, 2 вучылішчы, 2 багадзельні, 2 бальніцы, 2 царквы, касцёл, 2 сінагогі; з-ды: 44 гарбарныя, 2 вінакурныя, 2 махорачна-тытунёвыя, мылаварны, 2 піваварні; 75 крам, штотыднёвыя кірмашы. У 1-ю сусв. вайну у 1915—18 праз С. праходзіла лінія фронту, мястэчка разбурана. У 1920—22 у складзе *Сярэдняй Літвы*. З 1922 у складзе Польшчы, цэнтр гміны Ашмянскага пав. Віленскага ваяв. З 1939 у БССР, з 15.1.1940 горад, цэнтр *Смаргонскага раёна*. З 25.6.1941 да 5.7.1944 акупіравана ням. фашыстамі, якія загубілі ў горадзе і раёне 3896 чал. У 1970 — 10,1 тыс. ж.

Працуюць *Смаргонскі завод аптычнага станкабудавання*, *Смаргонскі завод сухога абястлушчанага малака*, прадпрыемства *«Смаргоньсілікатабетон»*, з-ды агрэгатны, камбікормавы, ліцейна-мех., ільнозавод; 7 сярэдніх школ, у т.л. школа-інтэрнат, 2 дзіцяча-юнацкія спарт. школы, Дом творчасці дзяцей і моладзі, Дом культуры, Смаргонскі гісторыка-краязнаўчы музей, бальніца. Брацкія магілы сав. воінаў. Помнік вызваліцелям. Помнікі архітэктуры: *Смаргонскі кальвінскі збор*, капліца.

Літ.: Ковкель И.И., Мараш И.Я. Сморгонь: Ист.-экон. очерк. Мн., 1984.

А.У.Ганчароў.

«СМАРГОНЬСІЛІКАТАБЕТО́Н», адкрытае акц. т-ва ў г. Смаргонь. Створана ў 1999 на базе аднайм. вытв. аб'яднання, утворанага ў 1976 пры аб'яднанні Смаргонскага камбіната сілікатных вырабаў (засн. ў 1969), смаргонскіх з-даў жалезабетонных вырабаў і драбільна-сартавальнага (усе ў в. Міхневічы Смаргонскага р-на). Мае асн. цэхі: сілікатнай цэглы, жалезабетонных вырабаў, ячэістага бетону, здабычы і перапрацоўкі нярудных матэрыялаў; дапаможныя: памольна-сыравінны, аўтатрансп., рамонтна-мех., парасілавы. Асн. прадукцыя (2002): газасілікатныя (ячэістыя) блокі, сілікатная цэгла, жалезабетонныя вырабы (пустотны насціл, фундаментныя блокі, дарожныя пліты, тратуарная плітка, бардзюрны камень, тэрматрывалыя сумесі і пліты), буд. пясок, гравій і інш.

СМАРЖО́К (Morchella), род сумчатых грыбоў сям. смаржковых. 15 відаў. Пашыраны ва ўмераным поясе Паўн. паўшар'я і ў Аўстраліі. На Беларусі найчасцей трапляюцца С. канічны (M.conica) і ядомы, або звычайны (M.esculenta). Веснавыя грыбы. Растуць на глебе ў лясах, на высечках, палянах, вогнішчах і інш. з крас. па май.

Пладовае цела — шапка на ножцы выш. 6—15 см. Шапка канічная, сеткава-ячэістая, прыросłая да ножкі, унутры полая. Колер ячэек ад шэра-вохрыстага да шакаладна-карычневага. Ножка цыліндрычная, таўшчынёй 2—3 см, белая ці жаўтаватая. Сумкі ў ячэйках, споры эліпсоідныя, гладкія, бясколерныя. Ядомыя.



Смаржок: 1 — канічны; 2 — ядомы.

1 2

СМАРО́ДЗІНЦАЎ Анатоль Аляксандравіч (19.4.1901, с. Аскіна, Башкартастан — 1986), расійскі вучоны ў галіне вірусалогіі і імуналогіі. Акад. АМН СССР (1966, чл.-кар. 1945). Скончыў Томскі ун-т (1923). З 1938 і з 1975 ва Усесаюзным ін-це эксперым. медыцыны, з 1967 у НДІ грыпу ў Маскве (да 1972 дырэктар). Навук. працы па механізмах процівіруснага імунітэту і па вакцынапрафілактыцы вірусных інфекцый. Стварыў вакцыны супраць грыпу, клешчавога энцэфаліту, адру. Дзярж. прэмія СССР 1941.

Тв.: Грипп. Л., 1961 (разам з А.А.Каровіным); Вирусные геморрагические лихорадки. Л., 1963 (разам з Л.І.Казбінцавым, В.Г.Чудаковым).

СМАРО́ДСКІ Аляксандр Паўлавіч (1850 — 24.10.1910), гісторык, педагог, грамадскі дзеяч. Скончыў Пецярбургскі гіст.-філал. ін-т (1876). З 1876 выкладчык Мінскай мужчынскай гімназіі, адначасова з 1887 сакратар Мінскага губ. стат. к-та. На працягу 10 гадоў адказны за выданне «Памятных кніжак Мінскай губерні», дзе змяшчаў свае артыкулы. Яго працы мелі кампілятыўны характар, напісаны ў вялікадзярж. духу. С. адмаўляў самастойнасць бел. народа і яго мовы. Да 9-га Усерас. археал. з'езда ў Вільні (1893) падрыхтаваў бібліягр. паказальнік публікацый па археал. даследаваннях у Мінскай губ., па выніках працы з'езда выдаў брашуру «Дзевяты археалагічны з'езд у Вільні і яго значэнне для Мінскай губерні» (1893). Адзін з заснавальнікаў і рэдактараў газ. *«Белорусский вестник»*, ініцыятараў стварэння Мінскага царк.-археал. к-та (1908).

У.В.Ляхоўскі.

СМАРЧКО́Ў Мікіта Іванавіч (н. 30.4.1916, в. Трафіменкі Дубровенскага р-на Віцебскай вобл.), Герой Сав. Саюза (1945). Скончыў Рыбінскі аэраклуб (1936), Балашоўскую ваен. школу пілотаў (1940). У Вял. Айч. вайну з 1941 на Калінінскім, Сталінградскім, Варонежскім, 1-м, 2-м, 3-м Укр. франтах камандзір эскадрыллі штурмавога авіяпалка. Удзельнік баёў пад Масквой, Варонежам, Курскай бітвы, на Украіне, у Румыніі, Югаславіі, Венгрыі. Капітан С. да снеж. 1944 зрабіў 196 баявых вылетаў. Да 1947 у Сав. Арміі, да 1991 на адм. і сав. рабоце. Ганаровы грамадзянін г. Дуброўна Аршанскага р-на.

СМАРЫ́ДА звычайная (Spicara smaris), рыба сям. смарыдавых атр. акунепадобных. Пашырана ва ўсх. ч. Атлантычнага ак., у Міжземным, Чорным, Азоўскім морах. Зрэдку заходзіць у нізоўі рэк.



Смарыда звычайная.

Даўж. да 20 см, маса да 80 г. Цела сціснутае з бакоў з падоўжнымі блакітнымі палосамі, укрытае ктэноіднай луской. Спінны плаўнік суцэльны, доўгі, анальны кароткі. Рот высоўны, сківіцы з дробнымі вострымі зубамі. Гермафрадыт. Драпежнік.

СМАТРЫ́ЦКІ Герасім Данілавіч (1-я пал. 16 ст., г.п. Смотрыч Дунаевецкага р-на Хмяльніцкай вобл., Украіна — кастр. 1594), бел. і ўкраінскі пісьменнік, педагог, грамадска-культ. дзеяч. Першы рэктар *Астрожскай школы* (з 1578). Разам з І.*Фёдаравым* рыхтаваў астрожскія выданні, у т.л. Астрожскую біблію і «Буквар» (1578). Аўтар прадмовы да Астрожскай бібліі (1580—81), палемічных трактатаў «Ключ царства нябеснага» і «Каляндар рымскі новы» (выд. 1587), у якіх на быт. і гіст. матэрыяле выкрываў рэліг. і эканам. засілле каталіцызму і польскіх улад, выступаў супраць сац. прыгнёту. Трактаты напісаны на мове, прыбліжанай да народнай, месцамі рытмізаваны, шмат прыказак і прымавак, частка якіх належыць С.

Тв.: У кн.: Архив Юго-Западной России. Киев, 1887. Ч. 1, т. 7.

Літ.: Українські письменники: Біобібліогр. словник. Т. 1. Київ, 1960.







М.І.**Смарчкоў**.

М.**Сматрыцкі**.

Я.В.**Смелякоў**.

СМАТРЫ́ЦКІ Мялецій (свецкае імя Максім Герасімавіч; 1577, г.п. Смотрыч Дунаевецкага р-на Хмяльніцкай вобл., Украіна — 27.12.1633), бел. і ўкр. пісьменнік-палеміст, грамадска-паліт. і царк. дзеяч. Сын Г.Д.*Сматрыцкага*. Першапачатковую адукацыю атрымаў пад кіраўніцтвам бацькі і вучонага грэка Кірылы Лукарыса, будучага канстанцінопальскага патрыярха. Скончыў Віленскую езуіцкую акадэмію. З 1601 служыў у кн. Б.Саламярэцкага (мяст. Баркулабава Аршанскага пав.). Разам з сынам князя ўдасканальваў веды ў Лейпцыгскім і Вітэнбергскім ун-тах, пабываў у Нюрнбергу, Вроцлаве, Вюрцбургу. Потым жыў у маёнтках Саламярэцкага каля Мінска. Уступіў у Віленскае правасл. брацтва пры Троіцкім манастыры, дзе зблізіўся з Л.*Карповічам*. Выступаў супраць *Брэсцкай уніі 1596*. Пісаў на стараж. бел. і ўкр., лац., польскай мовах (многія творы напісаны макаранічнай мовай). У 1608 супраць твораў І.Пацея «Ерасі...» і «Гармонія...» выдаў «Антыграфі...», у 1610 пад псеўданімам Тэафіл Арфалог — «Трэнас», дзе ад імя «маці-царквы», што сімвалізавала прыгнечаную радзіму, заклікаў народы Беларусі і Украіны да аб'яднання супраць каталіцызму. Твор выклікаў шырокую грамадска-паліт. рэакцыю. На яго кнігу палемічнымі творамі адказалі П.Скарга і І.Марахоўскі. У 1617 пастрыгся ў манахі пад імем Мялецій. Працаваў у брацкай школе *Віленскага Святадухаўскага манастыра*, рэктарам Кіеўскай брацкай школы (1618—20). Вынікам пед. дзейнасці стала «Грамматики словенския правильная синтагма...» (1618—1619, цяпер г. Вевіс, Літва), дзе ўпершыню на высокім навук. узроўні тлумачыліся арфаграфія, этымалогія, сінтаксіс і прасодыя. Больш як 2 стагоддзі яна была адным з самых аўтарытэтных падручнікаў па слав. мовазнаўстве, двойчы перавыдавалася ў Маскве (1648, 1721), вытрымкі з яе І.Капіевіч надрукаваў у Галандыі («Руководение во грамматику словенороссийскую», 1706). У 18 — 1-й пал. 19 ст. яна стала ўзорам для сербскай, харвацкай, рум. і балг. граматык. З 1620 архіепіскап полацкі, епіскап віцебскі і мсціслаўскі. Аўтар «Трактата пра паходжанне Святога Духа» і «Палінодыі...» (каля 1615), прадмовы да «Евангелля вучыцельнага патрыярха Каліста» (1616), «Казання... на чэснае пахаванне... Лявонція Карповіча» (1620), «Апраўданне нявіннасці» і «Абароны апраўдання» (1621), «Дадатку да абарон апраўдання» і «Выкрывання з'едлівых твораў» (1622), «Юстыфікацыі...» і «Супліка-цыі...» на імя сената і караля (1623). Напалоханы ўзмацненнем нац.-вызв. руху і забойствам уніяцкага архіепіскапа І.*Кунцэвіча*, паломнічаў па святых мясцінах Б.Усходу (1624—25). У 1627 тайна, у 1628 адкрыта перайшоў на бок уніятаў. У творах «Апалогія...», «Разважанне пра шэсць розніц паміж Усходняй і Заходняй цэрквамі», «Пратэстацыя» (усе 1628), «Паранэіс...» і «Экзатэ-іс...» (1629) адрокся ад сваіх антыуніяцкіх твораў, выступаў супраць правасл. пісьменнікаў-палемістаў С.Зізанія, Клірыка Астрожскага, Хрыстафора Філалета. С. — прадстаўнік барока. Стыль і мова яго твораў сталі ўзорам для Л.Карповіча, З.Капысценскага, А.Мужылоўскага і інш.

Літ.: Осинский А.С. Мелетий Смотрицкий, архиепископ Полоцкий. Киев, 1912; Загайко П.К. Українські письменники-полеміст кінця XVI — початку XVII ст. в боротьбі проти Ватікану і унії. Київ, 1957; Прокошина Е.С. Мелетий Смотрицкий. Мн., 1966; Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры. Т. 1. Мн., 1968; История белорусской дооктябрьской литературы. Мн., 1977; Німчук В.В. Граматика М.Смотрицького — перлина давнього мовознавства // Мелетий Смотрицький: Граматика. Київ, 1979; Короткий В.Г. Творческий путь Мелетия Смотрицкого. Мн., 1987.

У.Г.Кароткі.

СМАЎЖО́ЎСКІ ВЯЛІ́КІ КА́МЕНЬ, геалагічны помнік прыроды рэсп. значэння (з 2000). Размешчаны за 1,2 км на ПнЗ ад в. Смаўжы Слонімскага р-на Гродзенскай вобл. Шэры дробназярністы граніт з пражылкамі ружовага пегматыту. Даўж. 5,3 м, шыр. 2,9 м, выш. 1,2 м, у абводзе 13,9 м, аб'ём 9,8 м^3, маса бач-

най часткі 25,9 т. Прынесены ледавіком каля 220—150 тыс. г. назад з тэр. Швецыі. *В.Ф.Вінакураў.*

СМАЎЖЫ́, клас малюскаў, гл. *Бруханогія малюскі.*

СМА́ЧНЕЎ Віктар Андрэевіч (2.5.1939, с. Азёркі Нікіфараўскага р-на Тамбоўскай вобл., Расія — 15.11.1996), бел. акцёр. Засл. арт. Беларусі (1976). Скончыў тэатр. студыю пры Мічурынскім драм. т-ры (1959) і працаваў у ім у 1960—66. З 1967 у Гродзенскім абл. драм. т-ры. Яго творчасці ўласцівы глыбокае пранікненне ў вобраз, тыпізацыя характараў. Сярод роляў: Канягін («Мілы чалавек» К.Крапівы), Ксяндзоў («Апошні шанц» В.Быкава), Салавейчык («Амністыя» М.Матукоўскага), Харытон, Іаахім [«Адкуль грэх?», «Францыск Скарына» («Напісанае застаецца») А.Петрашкевіча], Карандышаў, Флор Фядулыч («Беспасажніца», «Апошняя ахвяра» А.Астроўскага), Гаеў («Вішнёвы сад» А.Чэхава), Фарацьеў («Фантазіі Фарацьева» А.Сакаловай) і інш.

А.А.Савіцкая.

СМЕ́ЛІ (Smalley) Рычард (н. 6.6.1943, г. Акран, штат Агайо, ЗША), амерыканскі хімік. Чл. Амер. акадэміі мастацтваў і навук (1990), Нац. АН ЗША (2000). Скончыў Мічыганскі ун-т (г. Ан-Арбар; 1965). З 1973 ва ун-це У.М.Райса (г. Х'юстан; з 1980 праф.). Навук. працы па даследаванні адкрытых ім *фулерэнаў*. Нобелеўская прэмія 1996 (з Р.*Кёрлам*, Г.*Крота*).

СМЕЛЯКО́Ў Яраслаў Васілевіч (8.1.1913, г. Луцк, Украіна — 27.11.1972), рускі паэт. Па паходжанні беларус. Працаваў у друкарні. У 1934—37 і 1948—55 рэпрэсіраваны. Друкаваўся з 1931. Першыя зб-кі — «Праца і каханне» і «Вершы» (абодва 1932). Рамантыка камсамольскага юнацтва, тэмы працы, пераемнасці пакаленняў, спалучэнне лірычнай патэтыкі з размоўнымі інтанацыямі і гумарам у кнігах вершаў «Дарога» (1934), «Крамлёўскія яліны» (1948), паэме «Строгае каханне» (1956). Глыбокае асэнсаванне жыцця, манум. публіцыстычнасць у зб-ках «Размова пра галоўнае» (1959), «Дзень Расіі» (1967, Дзярж. прэмія СССР 1967), «Таварыш Камсамол» (1968), «Снежань» (1970), паэме «Маладыя людзі» (1968). Суровы жыццёвы вопыт С. адлюстраваўся ў вершах-навелах, вершах-успамінах (апубл. 1987). Аўтар вершаў бел. тэматыкі «Беларусам», «Белая вежа», «Ода малодшаму лейтэнанту», публіцыст. і крытычных артыкулаў. На рус. мову пераклаў некат. вершы А.Куляшова. На бел. мову паасобныя яго вершы пераклалі М.Танк, Е.Лось, М.Аўрамчык, М.Калачынскі, Я.Семяжон.

Тв.: Собр. соч. Т. 1—3. М., 1977—78; Бел. пер. — у кн.: Дзень паэзіі, 1972. Мн., 1972; Выбранае. Мн., 1974.

Літ.: Дементьев В. Ярослав Смеляков: Сильный как терн. М., 1967; Рассадин С. Ярослав Смеляков. М., 1971.

У.А.Паўлаў.

СМЕРДЗЬ, Смерць, рака ў Лунінецкім р-не Брэсцкай вобл., левы прыток р. Прыпяць. Даўж. 37 км. Пл. вадазбору 502 км^2. Пачынаецца ад зліцця 2 каналаў за 1,5 км на ПнЗ ад в. Міжлессе, вусце за 4 км на ПдЗ ад в. Лахаўка. Цячэ ў межах Прыпяцкага Палесся. Даліна невыразная, зліваецца з прылеглай мясцовасцю. Пойма высокая, месцамі забалочаная, шыр. 200—300 м. Рэчышча каля вытоку каналізаванае і зарэгулявана шлюзам, на астатнім працягу звілістае, шыр. 5—10 м, у ніжнім цячэнні да 15 м.

СМЕ́РДЫ, назва сельскага насельніцтва ў дакументах 11—12 ст. ў Стараж. Русі. Напачатку С. называлі свабодных абшчыннікаў. Паступова з іх вылучылася залежная ад дзяржавы, а потым і ад феадалаў група «худых С.», якія мелі сваю гаспадарку, коней і інвентар, плацілі даніну (натуральны аброк) князю. Яны захоўвалі асабістыя свабоду і правы, адказвалі за правіннасці і злачынствы паводле тагачаснага права. У 13—15 ст. тэрмін «С.» паступова знік у сувязі з дыферэнцыяцыяй сялянства. Апошняя згадка пра С. на Беларусі ў дагаворнай грамаце 1440 вял. князя ВКЛ Казіміра Ягайлавіча пра ўстанаўленне міру і ўмовы гандлю Полацка і Віцебска з Ноўгарадам. Крыніцамі для вывучэння становішча С. з'яўляюцца *Руская праўда* і наступныя юрыд. акты.

А.П.Грыцкевіч.

СМЕ́РЖАЎ, возера ў Нараўлянскім р-не Гомельскай вобл., у бас. р. Прыпяць, за 28 км на ПдУ ад г. Нароўля. Пл. 0,32 км^2, даўж. 2,1 км, найб. шыр. 220 м, даўж. берагавой лініі 4,5 км. Схілы катлавіны на З выш. да 4 м, на У — 1—2 м, параслі хмызняком. Берагі нізкія, забалочаныя, пад хмызняком. Моцна зарастае. У С. растуць вадзяны арэх, сальвінія плывучая, занесеныя ў Чырв. кнігу Беларусі.

СМЕ́РЦЬ, неабарачальнае спыненне жыццядзейнасці; непазбежная канчатковая стадыя існавання жывога арганізма. Працэс надыходу С. вывучае *танаталогія*. Уласціва цэламу арганізму і яго часткам. Штодня ў жывым арганізме гінуць мільёны клетак розных органаў і тканак, у асобных тканках іх месца займаюць новыя.

Адрозніваюць С. натуральную (у доўгажыхароў; асобныя выпадкі), гвалтоўную (у выніку наўмысных ці ненаўмысных дзеянняў, няшчасных выпадкаў), паталаг. (заўчасная, выкліканая рознымі хваробамі). Прычыны гвалтоўнай С. вывучае суд. медыцына. С. ад хвароб абумоўлена развіццём цяжкіх ускладненняў. Калі ўскладненні развіваюцца раптоўна і хутка прыводзяць да С., яе наз. раптоўнай. Бывае таксама С. унутрывантробная (С. зародыша або плода, што настае ў арганізме маці на любым этапе ўнутрывантробнага жыцця, у т.л. пры родах). У цеплакроўных жывёл і чалавека С. найперш звязана са спыненнем дыхання і кровазвароту. Адрозніваюць 2 асн. этапы С. — т.зв. клінічную і біял. (сапраўдную). Клінічная С. (спыняецца дыханне і кровазварот, але клеткі і органы яшчэ жывуць) — абарачальны этап памірання, калі за 4—6 мін прыняць неабходныя меры (гл. *Рэанімацыя*). Магчыма ажыўленне і ў больш аддалены час, але ў кары галаўнога мозга ўзнікаюць неабарачальныя змены — С. мозга. Біял. С. неабарачальная — спыняюцца біял. працэсы ў клетках і тканках; пад уздзеяннем гідралітычных ферментаў, якія выдаляюцца з тканак, пачынаецца распад бялковых структур. У першую чаргу адбываецца распад залозістых органаў — падстраўнікавай залозы, печані. Біял. С. папярэднічае *тэрмінальны стан*.

Літ.: Саркисов Д.С. Очерки истории общей патологии. 2 изд. М., 1993; Патологическая анатомия и физиология. Мн., 1997.

М.К.Недзьведзь.

СМЕРЦЬ І БЯССМЕ́РЦЕ, два бакі быцця чалавека, якія ўзаемна выключаюць, але і ўзаемна прадугледжваюць адзін аднаго; адно з цэнтр. пытанняў філасофіі. У асэнсаванні праблемы С. і б. вылучаюць філас., рэліг. і прыродазнаўча-навук. аспекты. У ант. філасофіі ў працэсе аналізу С. і б. вызначыліся 2 асн. падыходы: матэрыялістычны (Дэмакрыт, Эпікур, Лукрэцый і інш.) і ідэалістычны (Сакрат, Платон і інш.). Згодна з матэрыялістычным падыходам, чалавек смяротны; на аснове прыродазнаўчых ведаў зроблены вывад, што з фіз. *смерцю* чалавека гіне і яго *душа*, г. зн. мысленне і свядомасць. Матэрыялісты лічаць бессмяротнымі створаныя чалавекам прадукты матэрыяльнай і духоўнай культуры і разглядаюць асобу як бессмяротную істоту толькі ў аспекце прадаўжэння роду. Эпікур, Сенека і інш. гал. задачай філасофіі лічылі збаўленне чалавека ад страху смерці. З процілеглых пазіцый разглядалі гэтую праблему С.К'еркегор, А.Шапенгаўэр, Ф.Ніцшэ, М.Хайдэгер, Ж.П.Сартр, А.Камю і інш. Паводле ідэаліст. канцэпцыі бяссмерце чалавека грунтуецца на існаванні абсалютнай ідэі ці бяссмерці чалавечай душы, чым у пэўнай ступені паслабляецца трагізм чалавечага быцця. Згодна з рэлігійнымі вучэннямі, чалавек бессмяротны, што вынікае з боскай прыроды душы, а фіз. смерць з'яўляецца вызваленнем душы ад матэрыяльнай абалонкі. Прыродазнаўча-навуковы падыход да праблемы С. і б. разглядае смерць як спыненне жыццядзейнасці, натуральны канец усялякай жывой істоты і абвяргае ідэю існавання чалавека пасля яго фіз. смерці. Спробы абгрунтаваць фіз. бяссмерце ў межах прыродазнаўства рабілі рас. вучоныя А.Л.Чыжэўскі, У.І.Вярнадскі і інш. Праблема С. і б. займае значнае месца ў гісторыі бел. філас. думкі, дзе знайшлі адлюстраванне як рэліг.-правідэнцыялістычны (М.Сматрыцкі, Сімяон Полацкі), так і прыродазнаўча-навук. (С.Будны, К.Лышчынскі і інш.) падыходы.

Літ.: Тейяр де Шарден П. Феномен человека: Пер. с фр. М., 1987; Вернадский В.И. Начало и вечность жизни: [Сб.]. М., 1989; Человек: Мыслители прошлого и настоящего о его жизни, смерти и бессмертии: Древний мир — эпоха Просвещения. М., 1991; Русский космизм: Антология

філос. мысли. М., 1993; Семеняя И.Н. Феномен жизни в аспекте полевой организации природы. Гродно, 1997; Бодрийар Ж. Символический обмен и смерть: Пер. с фр. М., 2000. *Т.І.Адула.*

СМЕРЧ, моцны віхор у атмасферы, які ўтвараецца ў навальнічнай хмары і прасіраецца да зямной паверхні ў выглядзе цёмнага слупа з лейкападобным расшырэннем зверху і знізу. Паветра ў ім верціцца супраць гадзіннікавай стрэлкі са скорасцю да 100 м/с і адначасова падымаецца па спіралі, захопліваючы знізу пыл, ваду і розныя прадметы. Узнікае пры значнай няўстойлівасці ніжняга слоя паветра і рухаецца са скорасцю 10—20 м/с, праходзіць шлях 40—60 км. Верагоднасць С. стымулюе блізкасць атм. фронту. Суправаджаецца навальніцай, дажджом, градам; адна з прычын *стыхійных бедстваў*. Над морам і акіянам утвараецца часцей, чым над сушай, дзе завецца *тромбам*, у ЗША — *тарнада*. На Беларусі штогод з сак. да вер. адзначаюць 1—2 выпадкі С., у асобныя гады (напр., у 1951) — да 5.

«СМЕРШ» (ад «смерць шпіёнам»), афіцыйная назва органаў сав. ваенная *контрразведкі* ў 1943—46. Паводле пастановы СНК СССР ад 19.4.1943 упраўленне асобых аддзелаў НКУС пераўтворана ў Гал. ўпраўленне контрразведкі «С.» і перададзена ў падпарадкаванне Нар. камісарыята абароны СССР. Паводле пастановы Дзярж. к-та абароны ад 31.5.1943 было створана таксама ўпраўленне контрразведкі Нар. камісарыята ВМФ. Пры франтах і флатах дзейнічалі аддзелы контрразведкі «С.».

Органы «С.» вялі барацьбу са шпіёнамі, дыверсантамі, ,тэрарыстамі, спынялі дзейнасць зарубежных разведак (гл. *Раздвека, Разведчык*) у часцях і ўстановах Чырв. Арміі, выконвалі інш. спец. заданні. У канцы 1943 — 1-й пал. 1944 на тэр. Беларусі дзейнічалі аддзелы контрразведкі «С.» 1-га, 2-га, 3-га Бел. і 1-га Прыбалт. франтоў (з кастр. 1943 пачалося фарміраванне БВА і яе органаў «С.»). У студз. 1945 БВА перайменавана ў Беларуска-Літоўскую ваен. акругу (БЛВА), а органы контрразведкі — у аддзелы «С» БЛВА (з ліп. 1945 Мінская і Баранавіцкая ваен. акругі). У сак. 1946 створана 3-е Гал. ўпраўленне (ваен. контрразведка) Мін-ва дзярж. бяспекі СССР, а ў ваен. акругах, у т.л. БВА (акруга адноўлена ў сак. 1946) — асобыя аддзелы. Гл. таксама *Камітэт дзяржаўнай бяспекі* Рэспублікі Беларусь.

Літ.: Долгополов Ю.Б. Война без линии фронта. М., 1981; Остряков С.З. Военные чекисты. М., 1979; Смирнов Н. «Смерш» против абвера // Армия. 2000. № 1—2. *В.М.Надтачаеў.*

СМЕ́ТАНА (Smetona) Антанас (10.8.1874, в. Ужуленіс Вільнюскага пав., Літва — 9.1.1944), літоўскі паліт. і дзярж. дзеяч, публіцыст. Юрыст. Скончыў Пецярбургскі ун-т (1902). У 1902—07 чл. Літ. дэмакр. партыі. У 1905—15 і 1923—24 рэдагаваў шэраг газет і часопіс. З 24.9.1917 да 4.4.1919 старшыня *Літоўскай тарыбы*. У крас. 1919 — чэрв. 1920 часовы прэзідэнт Літвы. У 1921 узначальваў дэлегацыю Літвы на перагаворах у Рызе па ўрэгуляванні літ.-лат. памежнага канфлікту. У 1923—26 выкладаў у Каўнаскім ун-це (з 1926 дацэнт). У 1924—40 лідэр партыі таўцінінкаў (Саюза літ. таўцінінкаў; з 1926 кіруючая партыя). Пасля ваен.-дзярж. пераварота 17.12.1926 з 19.12.1926 да 15.6.1940 зноў прэзідэнт Літ. Рэспублікі. Устанавіў у краіне аўтарытарны рэжым на ўзор фаш. Італіі. З уводам сав. войск у Літву 15.6.1940 эмігрыраваў у Германію; з сак. 1941 жыў у ЗША, дзе і памёр.

Тв.: Antano Smetonos korespondencija, 1940—1944. Kaunas, 1999.



Б.**Сметана**.

СМЕ́ТАНА (Smetana) Бедржых (2.3.1824, г. Літамішль, Чэхія — 12.5.1884), чэшскі кампазітар, дырыжор, піяніст, педагог, музычна-грамадскі дзеяч; заснавальнік чэшскай муз. класікі. Скончыў прыватную муз. школу ў Празе (1847). Вучань І.Прокша. У 1848 адкрыў сваю муз. школу, якая пазней стала цэнтрам канцэртнай і асветніцкай дзейнасці прагрэс. чэш. музыкантаў. З 1856 канцэртаваў у Швецыі. З 1861 у Чэхіі, узначаліў артыстычнае т-ва «Умелецка бяседа», кіраваў мужч. хорам «Глагол пражскі», пісаў для яго хоры на словы чэш. паэтаў, папулярызаваў музыку айч. і інш. слав. кампазітараў. У 1866—74 дырыжор Нац. т-ра оперы. Выступаў як муз. крытык. Пачынальнік розных жанраў нац. оперы і праграмнага сімфанізму. Яго творчасць, заснаваная на нар.-песенных інтанацыях і рытмах, вызначаецца яркім нац. каларытам, дэмакратычнасцю, патрыят. накіраванасцю, працягвае традыцыі рамант. праграмнага сімфанізму Ф.*Ліста*. Сярод твораў: оперы лірычна-камічная «Прададзеная нявеста» і гераічна-патрыят. «Брандэнбуржцы ў Чэхіі» (абедзве паст. 1866), трагічная «Далібар» (паст. 1868), «Дзве ўдавы» (паст. 1874), эпічная «Лібуша» (паст. 1881); для арк. — «Трыумфальная сімфонія» (1854), «Урачыстая увертюра» (1849); сімф. паэмы «Рычард III» (1858), «Лагер Валенштэйна» (1859), «Гакон Ярл» (1861); цыкл з 6 праграмных сімф. паэм «Мая Радзіма» (1858—79); 2 стр. квартэты (1876, 1883), фп. трыо, п'есы для фп., у т.л. «Чэшскія танцы» (2 сшыткі, 1877, 1879), хоры, песні і інш. У Дзярж. т-ры оперы і балета Беларусі паст. опера С. «Прададзеная нявеста» (1949). З 1946 штогод у дзень смерці С. праводзіцца Міжнар. муз. фестываль «Пражская вясна», які адкрываецца выкананнем яго твораў.

Літ.: Мартынов И.И. Бедржих Сметана. М., 1963; Гулинская З.К. Бедржих Сметана. М., 1968; Крунтяева Т. Бедржих Сметана, 1824—1884: Попул. моногр. 2 изд. Л., 1988. *І.Ю.В'югінава.*

СМЕ́ТНІКАВЫЯ КУ́РЫ, сямейства птушак, гл. *Веліканогія куры*.

СМЕ́ЦЦЕВЫЯ РАСЛІ́НЫ, тое, што *рудэральныя расліны*.

СМЕЦЦЕПРАВО́Д, прыстасаванне ў шматпавярховых жылых дамах і інш. будынках для выдалення сухога смецця па трубах. Складаецца са ствала з прыёмнымі клапанамі і смеццепрыёмнай камеры. Вядомы сістэмы мокрага выдалення харч. адходаў у каналізацыйную сетку, у якіх кухонныя ракавіны абсталёўваюцца прыстасаваннем для здрабнення адходаў.

СМЕЯНО́ВІЧ Арнольд Фёдаравіч (н. 11.8.1938, г. Бранск, Расія), бел. вучоны ў галіне нейрахірургіі. Д-р мед. н. (1982), праф. (1993). Засл. дз. нав. Беларусі (1998). Скончыў Мінскі мед. ін-т (1960). З 1975 у БелНДІ неўралогіі, нейрахірургіі і фізіятэрапіі (з 1998 дырэктар). Навук. працы па пытаннях пухлін галаўнога мозга (неўрыномы слыхавога нерва), анеўрызмаў сасудаў галаўнога мозга, астэахандрозу пазваночніка, траўматычных пашкоджанняў перыферычных нерваў. Дзярж. прэмія Беларусі 1994.

Тв.: Лицевой нерв в хирургии неврином слухового нерва. Мн., 1978 (у сааўт.); Артерио-венозные мальформации задней черепной ямки (у сааўт.) // Актуальные проблемы неврологии и нейрохирургии. 2000. Вып. 2.

СМІДО́ВІЧ Пётр Гермагенавіч (парт. псеўд. Дзюваль, Жэльє, Матрона, В.І.Зыбін, Чарвінскі, Марселец; 19.5.1874, г. Рагачоў Гомельскай вобл. — 16.4.1935), рэвалюцыянер, сав. дзярж. і парт. дзеяч. За рэв. дзейнасць у 1894 выключаны з Маск. ун-та і высланы. Вучыўся ў Парыжы, працаваў у Бельгіі. Чл. Бельгійскай рабочай партыі. З 1902 агент газ. «Искра»; адзін з арганізатараў падп. друкарні «Искра» ў г. Умань (1903). Чл. Сяроднеўральскага (1903), Паўн. (1904), Бакінскага і Тульскага (1905) к-таў РСДРП. Удзельнік Снеж. ўзбр. паўстання ў Маскве ў 1905. У 1906—08 чл. Маск. акр. і гар. к-таў РСДРП. За рэв. дзейнасць неаднойчы быў арыштаваны і сасланы. Пасля Люг. рэвалюцыі 1917 чл. Маск. к-та РСДРП(б), чл. Прэзідыума выканкома Массавета. У час Кастр. рэвалюцыі 1917 чл. Маск. ВРК. З 1918 старшыня Массавета, з 1919 Маскоўскага губ. СНГ. Чл. ВЦВК, чл. Прэзідыума ВЦВК, ЦВК СССР. Старшыня К-та садзеяння народнасцям паўн. ускраін пры ЦВК СССР. Удзельнік ліквідацыі ўзбр. выступлення сялян Тамбоўшчыны і Кранштацкага паўстання 1921. Чл. ЦКК РКП(б) у 1921—22.

СМІ́ЛАВІЦКІ КЛЯ́ШТАР МІСІЯНЕ́РАЎ. Існаваў у 1747—1832 у мяст. *Смі-*

лавічы. Засн. Марцыбелай Завішанскай з Агінскіх. Яна размясціла ксяндзоў-місіянераў пры драўляным касцёле і завяшчала грошы на мураваныя будынкі. У 1774 на ўскрайку мястэчка пры гасцінцы Мінск—Ігумен пабудаваны 2-павярховы мураваны корпус місійнага дома (кляштара). У 1785 асвячоны біскупам трохнефавы з 2-вежавым фасадам касцёл св. Тройцы, які з'яўляўся і парафіяльным. У сярэдзіне храма было 6 ілюзіяністычных алтароў з абразамі і скульптурамі. У 1832 кляштар закрыты, касцёл заставаўся парафіяльным да 1865; пазней ён перабудаваны пад царкву. Будынкі разбураны ў 1930-я г.

А.А.Ярашэвіч.

СМІЛАВІЦКІ ПАЛА́ЦАВЫ КО́МПЛЕКС, помнік сядзібна-палацавай архітэктуры 2-й пал. 19 ст. ў г.п. Смілавічы Чэрвеньскага р-на Мінскай вобл. Пабудаваны на месцы замка 17 ст. Мае рысы рамантызму і эклектыкі. Уключаў 2 палацы, шэраг гасп. пабудоў, парк пейзажнага тыпу (захаваўся фрагментарна). Цэнтр. будынак — 2-павярховы прамавугольны ў плане палац (не захаваўся) з эркерамі, атыкам, раскрапаваны пілястрамі і карнізамі, завершаны невял. бельведэрам. У палацы быў зімовы сад, багаты архіў (захаваліся дакументы ўладальнікаў маёнтка Агінскіх, Манюшкаў, Ваньковічаў), вял. б-ка, калекцыя твораў выяўл. мастацтва, сярод якіх карціна В.Ваньковіча «Адам Міцкевіч на скале Аюдаг», 1828). Другі палац — прамавугольны ў плане 2-павярховы будынак з эркерамі, завершаны 2-схільным дахам. На паркавым фасадзе 3-павярховы вежападобны аб'ём. Уваход на гал. фасадзе вылучаны 3-павярховым рызалітам з 2 фланкіруючымі гранёнымі вежачкамі, завершаны невысокімі шатрамі і шпілямі. Вежа паркавага фасада ўпрыгожана рустам, валютамі, складаным абрамленнем акна 3-га яруса, завершана атыкам, зубцамі.

Ю.А.Якімовіч.



Смілавіцкі палацавы комплекс. Фрагмент галоўнага фасада новага корпуса палаца.

СМІЛАВІЦКІ РАЁН, адм.-тэр. адзінка ў БССР у 1924—31 і 1935—38. Утвораны 17.7.1924 у Мінскай акр. Цэнтр — мяст. *Смілавічы.* 20.8.1924 падзелены на 10 сельсаветаў. 18.1.1931 раён скасаваны, сельсаветы перададзены Смалявіцкаму, Пухавіцкаму і Чэрвеньскаму р-нам. З 6.7.1935 да 11.2.1938 *Рудзенскі раён* быў перайменаваны ў Смілавіцкі, уключаў 12 сельсаветаў.

СМІЛАВІЦКІ СЕЛЬСКАГАСПАДА́РЧЫ ТЭ́ХНІКУМ. Засн. ў 1931 у г.п. Смілавічы Чэрвеньскага р-на як зоаветэрынарны тэхнікум. З 1981 саўгас-тэхнікум, з 1997 — с.-г. тэхнікум. Спецыяльнасці (2001/02 навуч. г.): ветэрынарыя, заатэхнія, пчалаводства. Прымае асоб з базавай і сярэдняй адукацыяй. Навучанне дзённае.

СМІЛАВІЧЫ, гарадскі пасёлак у Чэрвеньскім р-не Мінскай вобл., на р. Волма. На аўтадарозе Мінск—Магілёў, аўтадарогамі злучаны з Рудзенскам і Смалявічамі. За 21 км ад чыг. ст. Рудзенск на лініі Мінск—Асіповічы, за 30 км на З ад г. Чэрвень, за 32 км на ПдУ ад Мінска. 5,1 тыс. ж. (2001).

Вядомы з 1592 як вёска Мінскага пав. ВКЛ. Уласнасць Бакштанскіх, Кежгайлаў, Сапегаў, Завішаў, Агінскіх, з 1791 Манюшкаў. У С. бытавалі разнастайныя рамёствы і промыслы. З 1793 у Рас. імперыі, мястэчка, з 1795 цэнтр воласці Ігуменскага пав. У 1897 у С. 3498 ж., 498 двароў, вал. ўправа, 2 земскія нар. вучылішчы, 2 царк.-прыходскія школы, паштовая станцыя (з 1797), 2 царквы, касцёл, капліца, мячэць, 5 яўр. малітоўных дамоў, суконная ф-ка, 2 млыны, хлебазапасны магазін, некалькі гарбарняў, 58 дробных крам, 2 карчмы, 9 піцейных дамоў, штотыднёвыя таргі. З вер. 1923 у Чэрвеньскім пав. У 1924— 31 і 1935—38 вёска, цэнтр *Смілавіцкага раёна*, у 1931—35 у Пухавіцкім р-не. У 1924—26 і з 1938 цэнтр сельсавета. З 1938 у Рудзенскім р-не. У Вял. Айч. вайну акупіраваны ням. фашыстамі, якія загубілі тут больш за 2 тыс. жыхароў. З 1960 у Чэрвеньскім р-не. З 2.11.1963 гар. пасёлак.

Працуюць: валюшна-лямцавая ф-ка, гарбарны з-д, прадпрыемства камунальных паслуг, цэх апрацоўкі футра, мех. майстэрні, хлебапякарня, камбінат быт. паслуг; *Смілавіцкі сельскагаспадарчы тэхнікум*, ПТВ, 2 сярэднія і муз. школы, школа-інтэрнат, 2 дашкольныя ўстановы, Дом культуры, Дом дзіцячай творчасці, кінатэатр, 2 б-кі, бальніца, аптэка, аддз. сувязі; дзейнічаюць царква, мячэць, малітоўны дом. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан, магілы ахвяр фашызму. Помнік настаўнікам і вучням, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Помнік архітэктуры — *Смілавіцкі палацавы комплекс.*

Г.І.Дулеба.

СМІЛГА Івар Генісавіч (1892, Лифляндская губ., Латвія — люты 1938), савецкі парт. і дзярж. дзеяч. За рэв. дзейнасць неаднаразова быў арыштаваны царскімі ўладамі. Пасля Люг. рэвалюцыі 1917 уваходзіў у склад Кранштацкага к-та РСДРП(б), старшыня Абл. выканаўчага к-та арміі, флоту і рабочых Фінляндыі. Пасля Кастр. рэвалюцыі 1917 упаўнаважаны СНК РСФСР у Фінляндыі. У 1919—23 чл. Рэўваенсавета Рэспублікі, Зах. (май—кастр. 1920), Паўд. і Каўказскага франтоў, старшыня Савета прац. арміі паўд. ўсходу. 31.7.1920 падпісаў *Дэкларацыю аб аб'яднанні незалежнасці Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусь.* З 1923 нам. старшыні Дзяржплана СССР. У 1927 выключаны з ВКП(б) як прыхільнік трацкісцкай апазіцыі, у 1930 адноўлены. З 1930 нам. нач. Мабілізацыйнага ўпраўлення ВСНГ СССР. 2.1.1935 арыштаваны, сасланы, пасля расстраляны. Рэабілітаваны ў 1987.

Літ.: Ненароков А.П. Смилга И.Т. // Реввоенсовет Республики, 6 сент. 1918 г. — 28 авг. 1923 г. М., 1991.

А.В.Скараход, Я.С.Фалей.

СМІ́ЛЬГІС (Smilgis) Эдуардс (22.11.1886, Рыга — 19.4.1966), латышскі рэжысёр, акцёр. Нар. арт. СССР (1948). З 1911 акцёр Новага Рыжскага, з 1915 Петраградскага лат. т-раў. У 1920—64 заснавальнік, маст. кіраўнік, акцёр Маст. т-ра імя Я.Райніса (Рыга). Пастаноўкі С. вылучаліся манументальнасцю, гераіка-рамантычнай накіраванасцю, яркай тэатральнасцю: «Фауст» І.Гётэ (1940), «Ягор Булычоў і іншыя» М.Горкага (1946), «Агонь і ноч» Я.Райніса (1947, Дзярж. прэмія СССР 1947), «Марыя Сцюарт» Ф.Шылера (1956), «Гамлет» У.Шэкспіра (1959), «Аптымістычная трагедыя» У.Вішнеўскага (1964) і інш. Сярод роляў: Тотс («Гуляў я, скакаў» Райніса), Пер Гюнт («Пер Гюнт» Г.Ібсена), Гамлет («Гамлет» Шэкспіра), Дон Карлас («Дон Карлас» Шылера) і інш.

СМІ́РНА, старажытна-грэчаская назва г. *Ізмір* у Турцыі.

СМІ́РНЕНСКІ (сапр. Ізмірліеў) Хрыста (29.9.1898, Кукуш, Македонія — 18.6.1923), балгарскі паэт. Вучыўся ў тэхн. і ваен. вучылішчах. З 1920 супрацоўнічаў у гумарыстычных часопісах і інш. выданнях. Друкаваўся з 1915. Аўтар зб-каў гумарэсак «Рознакаліберныя ўздыханні ў вершах і прозе» (1918), вершаў «Хай будзе дзень!» (1922), паэм, у т.л. «Зімовыя вечары» (1923), сатыр. вершаў, фельетонаў, памфлетаў, нарысаў. Яго творчасць прасякнута рэв. пафасам. На бел. мову асобныя вершы С. перакладалі Н.Гілевіч, А.Разанаў, М.Хведаровіч.

Тв.: Бел. пер. — у кн.: Хай зорыць дзень! Мн., 1973; У кн.: Сто гадоў, сто паэтаў, сто песень. Мн., 1978; Рус. пер. — Избранное. М., 1954.

СМІРНО́ВА Лідзія Мікалаеўна (н. 13.2.1915, г. Мензелінск, Татарстан), расійская кінаактрыса. Нар. арт. СССР (1974). Скончыла Маскоўскае гар. тэатр. вучылішча (1938). З 1945 у Т-рыстудыі кінаакцёра ў Маскве. Стварыла характарныя і камед. вобразы ў кіно, сярод іх: Вара («Хлопец з нашага горада», 1942), Феня («Яна абараняе Радзіму», 1943), Смайда («У іх ёсць Радзіма», 1950), Марыя («Крутыя ўзгоркі», 1956),

Свацця («Жаніцьба Бальзамінава», 1965), Марыя Аляксандраўна («Дзядзечкаў сон», 1967), Дуська («Вясковы дэтэктыў», 1969), Еўдакія («Вяртанне сына», 1979) і інш. Знялася ў фільмах — «Прыгожа жыць не забараніш» (1982), «Веру ў каханне» (1986), «Шапка» (1990), «Дом» (1995), «Наследніцы» (2000) і інш. Сярод роляў у бел. фільмах: Шура («Маё каханне», 1940, кінадэбют), Марыя Сцяпанаўна («Новы дом»), Насця («Пагаворым, брат»), Алімпіяда (тэлефільм «Факір на час»). Дзярж. прэмія СССР 1951.

Літ.: Лидия Смирнова. М., 1985.

СМІРНО́ВА Ніна Іванаўна (10.12.1928, г. Наваржэў Пскоўскай вобл., Расія — 1988), бел. вучоны ў галіне ветэрынарыі. Д-р вет. н. (1963), праф. (1965). Скончыла Ленінградскі вет. ін-т (1951). З 1964 у Віцебскім вет. ін-це (з 1965 заг. кафедры). Навук. працы па пытаннях біялогіі ўзбуджальнікаў хвароб пчол, свіней, курэй, буйн. раг. жывёлы, метадаў іх дыягностыкі, прафілактыкі і лячэння.

Тв.: Профилактика и лечение гнильцовых заболеваний пчел антибиотиками и бактериофагом. Мн., 1967; Ветеринарная микробиология. Мн., 1979; Ідэнтыфікацыя вірусаў, выдзеленых пры лейкозе буйной рагатай жывёлы (у сааўт.) // Весці АН БССР. Сер. с.-г. навук. 1981. № 4.

СМІРНО́ВА Разалія Андрэеўна (н. 1.10.1946, Баку), бел. сацыёлаг і філосаф. Д-р філас. н. (1994). Скончыла Ленінградскі ун-т (1971). З 1990 у Ін-це сацыялогіі Нац. АН Беларусі (з 1999 заг. аддзела). Навук. працы па праблемах логікі і метадалогіі навук. ведаў, навукі як сац. ін-та і сферы чалавечай дзейнасці, чалавека як аб'екта і суб'екта сац. палітыкі. Распрацавала канцэпцыі сац.-псіхал. рэабілітацыі насельніцтва, якое пацярпела ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС, светапогляду як формы самасвядомасці і спосабу духоўна-практычнай дзейнасці чалавека і навук. пазнання, новыя метадалагічныя падыходы да вывучэння сац. рэальнасці, сац. стратыфікацыі і ідэнтыфікацыі асобы ў грамадстве.

Тв.: Социально-мировоззренческие основания научного познания. Мн., 1984; Природа социальной реальности: Бытие и познание. Мн., 1991; Изменение социальной реальности и поведение людей. Мн., 1992; Социальная политика суверенной Беларуси. Мн., 1996 (разам з С.А.Шавелем); Социальная реабилитация населения, пострадавшего в результате чернобыльской аварии. Мн., 1997 (з ім жа); Социальная структура, мобильность, идентификация. Мн., 1998 (разам з А.У.Рубанавым, С.А.Шавелем).

СМІРНО́Ў Аляксей Аляксеевіч (н. 14.2.1921, в. Кулеміха Вятлужскага р-на Ніжагародскай вобл., Расія), парт. і дзярж. дзеяч БССР. Скончыў Днепрапятроўскі горны ін-т (1945). У 1958—59 заг. аддзела ЦК КПБ, з 1959 1-ы сакратар Брэсцкага абкама КПБ, у 1962—64 нам. старшыні Бюро ЦК КПБ па кіраўніцтве прам-сцю і буд-вам, заг. аддзела цяжкай прам-сці і транспарту ЦК КПБ. З 1965 сакратар ЦК КПБ, старшыня К-та парт.-дзярж. кантролю ЦК КПБ і СМ БССР. Нам. старшыні СМ БССР, старшыня К-та нар. кантролю БССР. У 1968—78 сакратар ЦК КПБ. З 1978 у Маскве старшыня праўлення Цэнтрасаюза спажывецкіх т-ваў, у 1983—91 нам. міністра паліўнай прам-сці РСФСР. Чл. ЦК КПБ у 1960—81, Бюро ЦК КПБ у 1966—78. Дэп. Вярх. Савета БССР у 1959—63, 1970—75, Вярх. Савета СССР у 1962—70, 1974—83. *Я.С.Фалей.*

СМІРНО́Ў Аляксей Мікалаевіч (н. 17.12.1938, г. Маршанск Тамбоўскай вобл., Расія), бел. вучоны ў галіне тэхн. кібернетыкі і інфарматыкі. Д-р тэхн. н. (1987), праф. (1989). Скончыў Разанскі радыётэхн. ін-т (1961) і Ленінградскі політэхн. ін-т (1966). З 1969 у Бел. ун-це інфарматыкі і радыёэлектронікі, з 1996 у Ін-це сучасных ведаў (заг. кафедры). Навук. працы па аўтаматызаваных сістэмах кіравання якасцю вырабаў мікраэлектронікі. Распрацаваў метады апаратыўнага вызначэння ўзроўню надзейнасці і паскорана-фарсіраваных выпрабаванняў вырабаў мікраэлектронікі ва ўмовах вытв-сці.

Тв.: Прогнозирование качества систем. Мн., 1976 (разам з У.А.Прахарэнкам); Проектирование технических систем диагностирования. Л., 1982 (разам з Л.П. Глазуновым).

СМІРНО́Ў Анатоль Піліпавіч (н. 16.8.1925, с. Родзіна Алтайскага краю, Расія), бел. і рас. гісторык. Д-р гіст. н. (1963), праф. (1969). Скончыў Мінскі пед. ін-т (1946). Працаваў у Ін-це філасофіі і права АН Беларусі (1950—56), у Ін-це гісторыі АН СССР (1957—70), праф. Акадэміі грамадскіх навук пры ЦК КПСС (1971—80), кіраўнік праблемнай групы ў Ін-це славянаznаўства і балканістыкі Рас. АН (1981—88). Аўтар прац па гісторыі рэв.-дэмакр. руху на Беларусі ў 19 ст., пра дзейнасць К.Каліноўскага, Ф.Савіча і інш.

Тв.: Сигизмунд Сераковский. М., 1959; Франц Савіч. Мн., 1961; Революционные связи народов России и Польши, 30—60 гг. XIX в. М., 1962; Кастусь Калиновский. Мн., 1963; Восстание 1863 г. в Литве и Белоруссии. М., 1963.

СМІРНО́Ў (Смірноў-Галаванаў) Віктар Віктаравіч (н. 6.4.1934, Масква), расійскі і ўкр. артыст балета, балетмайстар. Засл. дз. маст. Украіны (1981). Скончыў Маскоўскае харэагр. вучылішча (1953). У 1953—74 саліст Вял. т-ра ў Маскве. З 1976 гал. балетмайстар Адэскага т-ра оперы і балета, з 1988 дырэктар і маст. кіраўнік Маскоўскага гар. балета. Яго пастаноўкам уласцівы выкарыстанне розных відаў сучаснага сцэн. танца, імкненне да сінтэзу яго выразных сродкаў, эксперыментатарства ў харэагр. лексіцы. Сярод партый: Вакх («Вальпургіева ноч» з оперы «Фауст» Ш.Гуно), Акцёр («Полымя Парыжа» Б.Асаф'ева) і інш. Сярод пастановак: балеты «Азоранасць» А.Пахмутавай (1973), «Вайна і мір» на музыку В.Аўчыннікава (1987), опера-балет «Вій» В.Губарэнкі (1984) і інш. Адзін са стваральнікаў рас. тэлебалета: «Рамэо і Джульета» на муз. П.Чайкоўскага (1968), «Трапецыя» на муз. С.Пракоф'ева (1970), «Белыя ночы» на муз. А.Шонберга (1972) і інш.

СМІРНО́Ў Генадзь Васілевіч (н. 18.10.1948, г. Віцебск), бел. фізік. Д-р тэхн. н. (2000). Скончыў БДУ (1972). З 1972 у НДІ парашковай металургіі, з 1993 заг. лабараторыі Ін-та імпульсных працэсаў. Навук. працы па механіцы дэфармаванага цвёрдага цела. Распрацаваў мадэлі і метады даследавання ўдарна-хвалевых працэсаў узаемадзеяння метал. цел, прапанаваў методыку разліку працэсаў зваркі выбухам слаістых кампазіцыйных матэрыялаў.

Тв.: Высокоскоростная деформация металлов. Мн., 1976 (у сааўт.); Эффекты динамической кумуляции. Мн., 1999. *М.П.Савік.*

СМІРНО́Ў Генадзь Дзмітрыевіч (н. 3.2.1933, с. Катышка Галышманаўскага р-на Цюменскай вобл., Расія), бел. вучоны ў галіне выліч. тэхнікі. Канд. тэхн. н. (1970). Засл. работнік прам-сці Беларусі (1976). Скончыў Маскоўскі энергет. ін-т (1957). З 1960 на Мінскім з-дзе ЭВМ, з 1972 у НДІ ЭВМ (у 1972—98 нам. дырэктара). Навук. працы па структуры, архітэктуры, надзейнасці выліч. машын, сістэм і комплексаў, аўтаматызацыі праектавання ЭВМ. Распрацаваў архітэктуру, прынцыпы пабудовы і выкарыстання ЭВМ «Мінск» і ЕС ЭВМ. Дзярж. прэмія СССР 1970. Ленінская прэмія 1983.

Тв.: Электронная вычислительная машина «Минск-32». М., 1972 (разам з В.У.Пржыялкоўскім, В.Я.Пыхціным); Электронная вычислительная машина ЕС-1022. М., 1979 (у сааўт.). *М.П.Савік.*

СМІРНО́Ў Дзмітрый Іванавіч (26.7.1901, в. Клімава Кастрамской вобл., Расія — 17.3.1975), удзельнік баёў на Беларусі ў Вял. Айч. вайну, Герой Сав. Саюза (1944), ген.-лейт. (1945). Скончыў курсы «Выстрал» (1929), Ваен. акадэмію імя Фрунзе (1936). У Вял. Айч. вайну на фронце з 1941. Вызначыўся ў 1944 у баях на Магілёўшчыне: стралк. корпус на чале з ген.-маёрам С. 24 чэрв. фарсіраваў р. Проня, вызваліў г. Чавусы, з баямі прайшоў 50 км на З, фарсіраваў Дняпро, прычыніў праціўніку значныя страты ў тэхніцы і жывой сіле. 28 чэрв. ўдзельнічаў у вызваленні Магілёва, захапіў у палон больш за 3 тыс. салдат і афіцэраў праціўніка. Да 1960 у Сав. Арміі.

СМІРНО́Ў Ігар Глебавіч (н. 6.9.1927, С.-Пецярбург), бел. і ўкраінскі дзеяч самадз. мастацтва, балетмайстар. Засл. работнік культ. Украіны (1967). Засл. дз. маст. Беларусі (1979). З 1953 працаваў у розных установах культуры Украіны, кіраваў самадз. танц. калектывамі. З 1969 кіраўнік пінскага нар. ансамбля танца «Палессе», з якім падрыхтаваў каля 50 харэагр. пастановак, у т.л. «Лявоны», «Лявоніха», «Ля ваколіцы», «Сказ пра Палессе», «Гапак», «Мэрцышор»,

«Брыул», якія ўвайшлі ў тэматычныя цыклы «Беларусь мая, родны край», «Памяць пакаленняў», «Народаў дружная сям'я». *Л.М.Баярышава.*

СМІРНО́Ў Канстанцін Мікалаевіч (31.5.1854 — пасля 1908), расійскі военачальнік. Ген.-лейт. (1904). З дваран Мінскай губ. Скончыў 2-е Канстанцінаўскае ваен. (1872) і Міхайлаўскае артыл. (1873) вучылішчы, Міхайлаўскую артыл. (1879?) і Мікалаеўскую Генштаба (1883) акадэміі. У пач. рус.-яп. вайны 1904—05 прызначаны камендантам крэпасці Порт-Артур (з падпарадкаваннем усіх сухап. войск у Порт-Артуры). Але рэальная ўлада над войскамі належала нач. Квантунскага ўмацаванага р-на ген.-лейт. А.М.Стэселю. Разам з ген.-лейт. Р.І.*Кандраценкам* С. стварыў і ўмацоўваў сістэму абароны, кіраваў адбіццём шэрагу штурмаў крэпасці. На ваен. савеце 29.12.1904 выказаўся за працяг барацьбы, але 2.1.1905 Порт-Артур быў здадзены Стэселем (гл. таксама *«Порт-Артура абарона»*). Пасля вайны разам з ген. Стэселем, В.Рэйсам і А.В.Фокам аддадзены пад суд за капітуляцыю крэпасці, апраўданы. 18.3.1908 выкліканы на дуэль Фокам (прыхільнікам капітуляцыі), якога С. абвінаваціў у здрадзе. На дуэлі С. цяжка паранены, з крас. 1908 у адстаўцы. Далейшы лёс невядомы. *А.М.Лукашэвіч.*

СМІРНО́Ў Мікалай Аляксандравіч (5.5.1898, Мінск — 19.11.1960), генерал-лейтэнант артылерыі (1958). Скончыў Міхайлаўскае артыл. вучылішча (1917), Кіеўскую школу камсаставу (1926). У Чырв. Арміі з 1918. Удзельнік грамадз. вайны на Зах. і Паўд. франтах: камандзір узвода, нам. камандзіра батарэі, ад'ютант дывізіёна. У Вял. Айч. вайну на Паўд., Сталінградскім, 1-м і 4-м Укр. франтах: камандзір артыл. палка, камандуючы артылерыяй дывізіі, корпуса, арміі. Удзельнік баёў пад Сталінградам, на Курскай дузе, у Польшчы, Чэхіі, Славакіі. У 1945—58 на адказных пасадах у Сав. Арміі.

СМІРНО́Ў Мікалай Міхайлавіч (н. 22.4.1919, Масква), бел. і расійскі вучоны ў галіне педыятрыі. Д-р мед. н. (1967), праф. (1968). Скончыў 1-ы Маскоўскі мед. ін-т (1941). З 1956 у Віцебскім мед. ін-це (заг. кафедры). З 1980-х г. у Маскве. Навук. працы па вывучэнні фізіялогіі і паталогіі кровазвароту, дыхання і стрававання ў дзяцей.

Тв.: Изменения сердечно-сосудистой системы у детей в различные периоды пневмонии // Сердечно-сосудистая патология при заболеваниях органов дыхания и ревматизме у детей. М., 1959; Бронхопневмония у детей раннего возраста // Инфекционно-аллергические заболевания у детей. М., 1965.

СМІРНО́Ў (Смірноў-Святлоўскі) Пётр Іванавіч (14.8.1897, г. Чырвоны Сулін Растоўскай вобл., Расія — 17.3.1940), военачальнік, флагман флоту 2-га рангу (1938). Скончыў Ваенна-марскую акадэмію (1927). З кастр. 1917 адзін з камісараў і нач. штаба зводнага Кранштацкага атрада. У 1918 камісар атрада маракоў-падрыўнікоў на Петраградскім напрамку, нач. штаба Волжскай ваен. флатыліі, камандзір асобнага атрада на Усх. фронце. З вер. 1919 — да снеж. 1920 камандуючы *Дняпроўскай ваеннай флатыліяй* (ДВФ), чл. ваен. савета Гомельскага ўмацаванага раёна. Удзельнік *Лоеўскага прарыву 1920*, баёў за Нароўлю, Мазыр, Петрыкаў, Тураў, кіраўнік прарыву караблёў ДВФ з Мазыра ў тыл праціўніка. У 1924 камісар і старшы пам. камандзіра вартавога карабля «Вароўскі», які ў 1924 здзейсніў далёкае плаванне вакол Еўропы і Азіі (з Архангельска ва Уладзівасток). Пазней працаваў саветнікам ВМФ у Кітаі. З 1927 на адказных пасадах у ВМФ СССР, у т.л. (у студз. 1938 — сак. 1939 1-ы нам. і часова выконваючы пасаду наркома ВМФ СССР). Дэп. Вярхоўнага Савета СССР у 1936—40. Аўтар успамінаў «Дняпроўская ваенная флатылія» (1925). *І.Я.Краўцоў.*



Г.Дз.**Смірноў**.



С.С.**Смірноў** (пісьменнік).



У.І.**Смірноў**.

СМІРНО́Ў Сяргей Сяргеевіч (16.9.1895, г. Іванава, Расія — 20.8.1947), расійскі геолаг-мінералог. Акад. АН СССР (1943, чл.-кар. 1939). Скончыў Петраградскі горны ін-т (1919). У 1919—41 у Геал. к-це, адначасова праф. Ленінградскага горнага ін-та. З 1945 у Ін-це геал. навук АН СССР. Даследаваў рудныя радовішчы Урала, Забайкалля, Д. Усходу і ПнУ Расіі. Навук. працы па мінералогіі рудных радовішчаў і праблемах рудаўтварэння. Стварыў металагенічны кірунак у вучэнні аб карысных выкапнях. Дзярж. прэмія СССР 1946. Яго імем названы гара на п-ве Таймыр, пасёлак, радовішча алавяна-поліметал. руд у Прыморскім краі і мінерал смірнаўскіт.

Тв.: Избр. труды. М., 1955; Рудные месторождения и металлогения восточных районов СССР. М., 1962.

СМІРНО́Ў Сяргей Сяргеевіч (26.9.1915, С.-Пецярбург — 22.3.1976), рускі пісьменнік. Скончыў Маскоўскі энергетычны ін-т (1937), Літ. ін-т імя М.Горкага ў Маскве (1941). Удзельнік Вял. Айч. вайны. З 1946 працаваў у «Воениздате», час. «Новый мир», гал. рэдактарам «Литературной газеты» (1959—60). Друкаваўся з 1934 як журналіст. На дакумент. матэрыяле напісаны яго кнігі «На палях Венгрыі» і «Сталінград на Дняпры» (абедзве 1954). Творы С. ўпершыню ўзнавілі гераізм абаронцаў Брэсцкай крэпасці ў 1941: «Крэпасць на граніцы» (1956), «У пошуках герояў Брэсцкай крэпасці» і «Брэсцкая крэпасць» (абедзве 1957, дапоўненае выд. 1964; Ленінская прэмія 1965), «Героі Брэсцкай крэпасці» (1959), «Апавяданні пра невядомых герояў» (1963), «Таран над Брэстам» (1965), «Мы — з Брэста» (1972), «Героі Вялікай вайны» (1977, прадмова В.Быкава), п'есы «Крэпасць над Бугам» (паст. Бел. т-рам імя Я.Коласа, 1956), «Людзі, якіх я бачыў» (паст. Брэсцкім і Магілёўскім абл. драм. т-рамі, 1958). Яго выступленні ў друку, па радыё і тэлебачанні садзейнічалі разгортванню масавага руху па выяўленні малавядомых старонак мужнасці сав. воінаў у Вял. Айч. вайну. Аўтар дакумент. нарысаў, сцэнарыяў дакумент. і маст. кінафільмаў на тэму Вял. Айч. вайны. На бел. мову творы С. перакладалі А.Бажко, А.Бачыла. Яго імем названа вуліца ў Брэсце; С. прысвечаны стэнд у музеі абароны Брэсцкай крэпасці, у ім зберагаецца архіў пісьменніка.

Тв.: Собр. соч. Т. 1—3. М., 1973; Рассказы о неизвестных героях. Мн., 1989; Брестская крепость: Док. кн. Мн., 1991; Бел. пер. — Брэсцкая крэпасць: Кароткі нарыс гіст. абароны 1941 г. Мн., 1958; Брэсцкая крэпасць. Мн., 1967.

Літ.: Быкаў В. Сяргей Смірноў // Быкаў В. Праўдай адзінай. Мн., 1984; Воспоминания о С.С.Смирнове. М., 1987. *А.І.Махнач.*

СМІРНО́Ў Уладзімір Іванавіч (10.6.1887, С.-Пецярбург — 11.2.1974), расійскі матэматык. Акад. АН СССР (1943; чл.-кар. 1932). Герой Сац. Працы (1967). Скончыў Пецярбургскі ун-т (1910). У 1912—30 праф. Ленінградскага ін-та інжынераў шляхоў зносін. З 1915 у Ленінградскім ун-це (з 1944 заг. кафедры). Адначасова ў 1929—35 у Сейсмалагічным ін-це (заг. аддзела) і Матэм. ін-це АН СССР. У 1937—55 дырэктар Ін-та матэматыкі і механікі пры Ленінградскім ун-це. Навук. працы па краявых задачах матэм. фізікі, тэорыі функцый комплекснай пераменнай, тэорыі пругкасці. Дзярж. прэмія СССР 1948.

Тв.: Курс высшей математики. Т. 1—5. М.; Л., 1924—47.

Літ.: В.И.Смирнов. М.; Л., 1949; Ладыженская О.А. О жизни и научной деятельности В.И.Смирнова: Биогр. очерк // Успехи мат. наук. 1987. Т. 42, вып. 6.

СМІРНО́Ў Уладзімір Іванавіч (31.1.1910, Масква — 16.6.1988), расійскі геолаг. Акад. АН СССР (1962, чл.-кар. 1958),

Герой Сац. Працы (1980). Скончыў Маскоўскі геолагаразведачны ін-т (1934), дзе і выкладаў у 1934—41 і 1944—49, адначасова ў 1934—37 у Таджыкска-Памірскай экспедыцыі. У 1946—51 нам. міністра геалогіі СССР. У 1949—52 у Маскоўскім ін-це каляровых металаў і золата, з 1951 у Маскоўскім ун-це. З 1968 гал. рэдактар журнала «Геология рудных месторождений», у 1969—75 акад.-сакратар Аддз. геалогіі, геафізікі і геахіміі і чл. Прэзідыума АН СССР. Навук. працы па геалогіі і генезісе эндагенных рудных радовішчаў, геал. асновах і метадах пошуку, разведкі і ацэнкі радовішчаў, праблемах металагеніі. Ленінская прэмія 1972. Дзярж. прэмія СССР 1986. Яго імем названы 2 мінералы: вісмірнавіт і смірніт.

Тв.: Геология ртутных месторождений Средней Азии. М., 1947; Геологические основы поисков и разведок рудных месторождений. 2 изд. М., 1957; Геология полезных ископаемых. 4 изд. М., 1982.

СМІРНО́Ў Уладзімір Яфімавіч (18.1.1924, г. Барнаул Алтайскага краю, Расія — 14.11.1943), удзельнік баёў на Беларусі ў Вял. Айч. вайну, Герой Сав. Саюза (1944). З 1943 на 1-м Прыбалт. фронце. Камандзір аддзялення старшы сяржант С. вызначыўся пры вызваленні Лёзненскага р-на Віцебскай вобл. 14.11.1943 у баі за вышыню каля в. Шумшчына закрыў сваім целам кулямёт праціўніка, што садзейнічала авалоданню вышынёй.

СМІРНО́Ў Юрый Васілевіч (2.9.1925, в. Дзешукова Макар'еўскага р-на Кастрамской вобл., Расія — 25.6.1944), удзельнік баёў на Беларусі ў Вял. Айч. вайну, Герой Сав. Саюза (1944). Стралок мал. сяржант С. вызначыўся 24.6.1944 у баі каля в. Шалашына Аршанскага р-на Віцебскай вобл., дзе цяжка паранены трапіў у палон да гітлераўцаў і, нягледзячы на катаванні, не выдаў ваен. тайну, быў распяты на сцяне бліндажа. У вёсках Бераснёва Аршанскага, Буда і Шалашына Дубровенскага р-наў, у г. Орша і г.п. Арэхаўск Віцебскай вобл. яму пастаўлены помнікі.

СМІРНО́Ў Юрый Васілевіч (15.10.1928, в. Даманава Ржэўскага р-на Цвярской вобл., Расія — 25.4.1997), бел. спявак (лірычны тэнар). Засл. арт. Беларусі (1968). Скончыў Саратаўскую кансерваторыю (1954). З 1954 саліст Омскага т-ра муз. камедыі. У 1958—89 саліст Дзярж. к-та Беларусі па тэлебачанні і радыёвяшчанні. Прапагандыст вак. музыкі бел. кампазітараў. Сярод запісаных на тэлебачанні і радыё: оперныя партыі — Конрад («Кветка шчасця» А.Туранкова), палкоўнік Лосеў («Кастусь Каліноўскі» Дз.Лукаса), Саўка Мільгун («У пушчах Палесся» А.Багатырова); вак. цыклы «Аб каханні і працы» С.Аксакава на словы П.Прыходзькі, «Поры года» Лукаса на словы Э.Агняцвет, «Бедны Пётр» П.Падкавырава на словы Г.Гейнэ, кантата «Палі стэпавыя» І.Кузняцова на словы А.Дзеружынскага і К.Разганаева.

Дз.М.Жураўлёў.

СМІРНО́Ў-САКО́ЛЬСКІ (сапр. Смірноў) Мікалай Паўлавіч (17.3.1898, Масква — 13.1.1962), расійскі артыст эстрады, бібліяфіл. Нар. арт. Расіі (1957). З 1915 выступаў на эстрадах летніх т-раў, у т-ры мініяцюр «Адэон» (Масква). Аўтар і выканаўца фельетонаў-маналогаў, куплетаў. Адзін з заснавальнікаў і маст. кіраўнік (з 1954) Маскоўскага т-ра эстрады. Аўтар прац па гісторыі кнігі. Сабраў унікальную б-ку першых і прыжыццёвых выданняў рус. класікаў 18—20 ст., літ. альманахаў і зб-каў, кніг, забароненых цэнзурай.

Тв.: Рассказы о книгах. М., 1959; Моя библиотека. Т. 1—2. М., 1963; Сорок пять лет на эстраде. М., 1976.





СМІ́РЫН Майсей Мендэлевіч (4.11.1895, г. Дзісна Міёрскага р-на Віцебскай вобл. — 20.5.1975), савецкі гісторык-медыявіст. Замежны чл. АН Германскай Дэмакр. Рэспублікі (з 1956). Д-р гіст. н. (1946). З 1930 выкладаў усеаг. гісторыю ў ВНУ г. Ніжні Ноўгарад, з 1935 у Маскве у пед. ін-тах. З 1938 супрацоўнік Ін-та гісторыі АН СССР. Даследаваў сацыяльна-эканам. і паліт. жыццё Германіі 15—16 ст. Асн. працы: «Народная рэфармацыя Томаса Мюнцэра і Вялікая сялянская вайна» (1947, Дзярж. прэмія СССР 1948), «Нарысы гісторыі палітычнай барацьбы ў Германіі перад Рэфармацыяй» (1952), «Да гісторыі ранняга капіталізму ў германскіх землях (XV—XVI стст.)» (1969).

СМІТ (Smith) Адам (5.6.1723, Керколды, Вялікабрытанія — 17.7.1790), шатландскі эканаміст і філосаф; класік эканам. навукі. Вучыўся ва ун-тах Глазга (1737—40) і Оксфарда (1740—46). Праф. логікі (1751), філасофіі (1752—63) ун-та Глазга. Гал. яго праца «Даследаванне аб прыродзе і прычынах багацця народаў» (1776). У аснове вучэння С. было разуменне, што эканам. законы, як і законы прыроды, вызначаюць развіццё грамадства. Адыграў важную ролю ў распрацоўцы тэорыі прац. вартасці. Даказаў, што вартасць стварае не толькі праца ў пэўнай галіне, а ўсякая праца ў кожнай галіне вытв-сці. Упершыню прааналізаваў класавую структуру грамадства; вылучаў 3 класы: землеўладальнікаў, наёмных рабочых і капіталістаў. Распрацаваў тэорыю зямельнай рэнты, у якой нароўні з навук. палажэннямі былі і памылковыя. Супярэчлівай была і яго тэорыя заработнай платы. Абараняў свабодную канкурэнцыю. Лічыў, што функцыі дзяржавы павінны абмяжоўвацца абаронай краіны, барацьбой са злачынствам і ажыццяўленнем тых гасп. мерапрыемстваў у эканам. жыцці, якія не пад сілу прамысл. буржуазіі. Навук. бок вучэння С. значна паўплываў на развіццё паліт. эканоміі ў свеце.

Літ.: Аникин А.В. Адам Смит. М., 1968.

І.В.Катляроў.

СМІТ (Smith) Гамільтан Отанел (н. 23.8.1931, Нью-Йорк), амерыканскі вучоны ў галіне генетыкі і мікрабіялогіі. Чл. Нац. АН ЗША. Чл.-кар. Амер. акадэміі мастацтваў і навук. Скончыў Каліфарнійскі ун-т (1952), мед. каледж ун-та Дж.Хопкінса (1956), дзе і працуе з 1967 (праф. мікрабіялогіі з 1973, праф. малекулярнай біялогіі і генетыкі з 1981). Навук. працы па вывучэнні ферментатыўных механізмаў сістэм рэстрыкцыі-мадыфікацыі, ферменталогіі генет. рэкамбінацый, механізмаў бактэрыяльных трансфармацый, генет. рэгуляцыі ў пракарыётаў і эўкарыётаў. Адкрыў рэстрыкцыйныя ферменты. Нобелеўская прэмія 1978 (разам з В.*Арберам* і Д.*Натансам*).



У.Я.**Смірноў**.

Ю.В.**Смірноў**.

Г.**Сміт**.

СМІТ (Smith) Майкл (26.4.1932, г. Блэкпул, Вялікабрытанія — 4.10.2000), канадскі біяхімік. Чл. Канадскага каралеўскага т-ва (1981), Лонданскага каралеўскага т-ва (1986), замежны чл. Нац. АН ЗША (1996). Скончыў Манчэстэрскі ун-т (д-р філасофіі, 1956). З 1966 праф. ун-та прав. Брыт. Калумбіі (г. Ванкувер, Канада), у 1987—95 дырэктар створанай ім пры ун-це Лабараторыі біятэхналогій. З 1997 дырэктар Кан. інавацыйнага фонду. Навук. працы ў галіне біятэхналогій. Прапанаваў метад накіраванага мутагенезу пры дапамозе алігануклеатыдаў, што зрабіла магчымым атрыманне малекул бялкоў з неабходнай паслядоўнасцю амінакіслот (бялковая інжынерыя). Нобелеўская прэмія 1993.

Б.В.Корзун.

СМІТ (Smith) Стывен (н. 30.12.1958, Фенікс, ЗША), касманаўт ЗША. Скончыў Станфардскі ун-т (1982). З 1992 у групе касманаўтаў НАСА (з 2001 нам. камандзіра атрада касманаўтаў). Здзейсніў 3 палёты ў складзе экіпажаў касм. караблёў (КК): 30.9—11.10.1994 на КК

«Індэвар», 11.2—21.2.1997 і 20.12—28.12.1999 на КК «Дыскаверы». Правёў у космасе 29,2 сут, у т.л. ў адкрытым космасе 35,6 гадз (5 выхадаў).

У.С.Ларыёнаў.

СМІТСАНІ́Т (ад імя англ. мінералога і хіміка Дж.Смітсана), цынкавы шпат, мінерал класа карбанатаў, карбанат цынку $ZnCO_3$. Змяшчае аксід цынку (ZnO) да 64,99% (Zn — 52%). Прымесі медзі, магнію, марганцу, жалеза, кобальту, кадмію і інш. Крышталізуецца ў трыганальнай сінганіі. Утварае зямлістыя ці шчыльныя скрытакрышт. агрэгаты, нацечныя формы, скарынкі. Колер белы, зялёны, светла-карычневы, жоўты і інш., бывае бясколерны. Паўпразрысты. Бляск шкляны з перламутравым адлівам. Цв. 4,5—5. Шчыльн. 4,1—4,5 г/см^3. Крохкі. Утвараецца ў зонах акіслення свінцова-цынкавых сульфідных радовішчаў. Руда цынку.

СМОГ (англ. smog ад smoke дым + fog туман), канцэнтраванае забруджванне прыземных слаёў атмасферы ў вял. гарадах і прамысл. цэнтрах. Звычайна назіраецца пры інверсіях т-ры і слабай турбулентнасці паветра. Вылучаюць вільготны (лонданскі тып) — густы туман з дамешкамі дыму або газавых адходаў вытв-сці; сухі або фотахім. (лос-анджэлескі) — сіняватая дымка з едкіх газаў і аэразоляў павышанай канцэнтрацыі (без туману), якая ўзнікае пад уздзеяннем ультрафіялетавай сонечнай радыяцыі на канцэнтраваныя газавыя выкіды аўтамабіляў і прамысл. прадпрыемстваў; ледзяны (аляскінскі) — узнікае пры нізкіх т-рах паветра ў выніку быт. выкідаў і пары з ацяпляльных сістэм. Інтэнсіўны і працяглы С. можа стаць прычынай абвастрэння хранічных хвароб, выклікаць удушша, раздражненне вачэй, пашкоджанне расліннасці і інш.



Смітсаніт.

СМОЛАКУРЭ́ННЕ, вытворчасць смалы спосабам сухой перагонкі асмолу. Вядома з даўніх часоў, у т.л. ўсх. славянам. Смалу выкарыстоўвалі для прасмолкі марскіх і рачных суднаў, канатаў, рыбацкіх невадоў і інш. На Беларусі ў 13 ст. ажыўлены гандаль смалою з Ганзай праз Рыжскі порт вёў Полацк. Вытворчасць і экспарт смалы павялічыліся ў 16 ст., асабліва ў 18 — 1-й пал. 19 ст. Памешчыкі, уладальнікі лясных угоддзяў развівалі смалакурны промысел для павелічэння таварнасці сваіх гаспадарак. З канца 18 ст. гандаль смалой ішоў праз паўд. парты Херсон, Адэсу. Смалакурны промысел быў найб. пашыраны на Падняпроўі і Палессі (Магілёўская і Мінская губ.). У 1804—10 на смалакурнях Мінскай губ. штогод выраблялі да 40 тыс., у Магілёўскай губ. да 20 тыс. бочак смалы. Смалу гналі ў асноўным прыгонныя сяляне, а пасля адмены прыгоннага права — сяляне-саматужнікі і купцы-лесапрамыслоўцы. Традыц. спосабы С. — ямны, майданны і ў смалакурных печах. К канцу 20 ст. саматужнае С. заняпала. Да 1980-х г. вытворчасцю смалы займаліся некаторыя леспрамгасы.

Н.І.Буракоўская.

СМО́ЛАНД (Småland), узвышша на Пд Швецыі, скляпеннепадобная ч. Балтыйскага шчыта. Складзена з гранітаў і гнейсаў. Выш. да 377 м (г. Тумтабакен). Рэльеф узгоркава-марэнны, озавыя грады. Вяршынная паверхня платопадобная, расчлянёна далінамі парожыстых рэк. Шмат азёр, балот, тарфянікаў. Хвойныя і мяшаныя лясы, верасоўнікі.

СМО́ЛЕТ (Smollett) Тобаяс Джордж (19.3.1721, Далкхарн, каля г. Дамбартан, Вялікабрытанія — 17.9.1771), англійскі пісьменнік. Вывучаў медыцыну ва ун-це г. Глазга. Літ. дзейнасць пачаў у 1746. Вядомасць прынеслі раманы «Прыгоды Родрыка Рэндама» (1748), «Прыгоды Перыгрына Пікля» (1751), у якіх перапляліся рысы барока і асветніцкага класіцызму. Крызіс асветніцкай свядомасці выявіўся ў раманах «Прыгоды графа Фердынанда Фэтама» (1753) і «Прыгоды сэра Ланселота Грыўза» (1762), блізкіх да паэтыкі перадрамантызму і сентыменталізму. Найб. значны твор — эпісталярны раман у рэчышчы сентыменталізму «Падарожжа Хамфры Клінкера» (1771), адметны багаццем камічных сродкаў для характарыстыкі гратэскных персанажаў, дэмакр. пафасам, псіхал. майстэрствам у абмалёўцы характараў. Аўтар гіст. прац, у т.л. «Поўнай гісторыі Англіі» (1757—58), паэт. і сатыр. твораў, перакладаў.

Тв.: Рус. пер. — Приключения Родрика Рэндома. М., 1949; Приключения Перигрина Пикля. М., 1955; Путешествие Хамфри Клинкера. М., 1983.

Літ.: Елистратова А.А. Английский роман эпохи Просвещения. М., 1966.

СМО́ЛІК Аляксандр Іванавіч (н. 24.10.1944, в. Каловічы Вілейскага р-на Мінскай вобл.), бел. культуролаг і гісторык. Д-р культуралогіі (2000), канд. гіст. н. (1973), праф. (1999). Скончыў Мінскі пед. ін-т (1968) і працаваў у ім з 1968 (у 1972—92 дэкан ф-та). З 1992 прарэктар Бел. ун-та культуры. Навук. працы па гісторыі Беларусі, тэорыі культуры, праблемах развіцця сусв. і айч. культуры і яе ўзаемадзеянняў з сац.-паліт. ін-тамі грамадства. Распрацаваў канцэпцыю рэабілітацыйна-кастарсіснага ўздзеяння мастацтва на дэзадаптаваную асобу посткатастрофнага соцыуму, новыя метадалагічныя падыходы ў вывучэнні сацыядынамікі культуры; вызначыў сутнасць, змест і дзейнасць сац. ін-таў у посткатастрофным грамадстве.

Тв.: Гісторыя Беларусі XVI—XIX стст. Мн., 1997; Культура Беларусі XI—XIX стст. Мн., 1998; Дзейнасць устаноў культуры па мінімізацыі наступстваў чарнобыльскай трагедыі. Мн., 1999 (у сааўт.); Сацыядынаміка культуры ў посткатастрофным соцыуме. Мн., 1999; Сацыяльна-культурная дзейнасць у постчарнобыльскім соцыуме. Мн., 1999; Гісторыя і культура беларускіх татар. Мн., 2000 (разам з І.Б.Канапацкім).

СМО́ЛІЧ Аркадзь Антонавіч (17.9.1891, в. Бацэвічы Клічаўскага р-на Магілёўскай вобл. — 17.6.1938), дзеяч бел.



А.А.**Смоліч**.

нац.-дзярж. адраджэння, вучоны ў галіне эканомікі, сельскай гаспадаркі, картаграфіі, геаграфіі. Праф. (1927). Скончыў Мінскую духоўную семінарыю (1905), Новаалександрыйскі ін-т сельскай гаспадаркі і лесаводства ў Пулавах (Польшча, 1916), вучыўся ў Кіеўскім політэхн. ін-це. З 1910 чл. *Беларускай сацыялістычнай грамады* (БСГ). Актыўны ўдзельнік клуба *«Беларуская хатка»* ў Мінску. На канферэнцыі БСГ у чэрв. 1917 увайшоў у склад яе часовага ЦК, быў рэдактарам газ. *«Грамада»*. Удзельнік *Усебеларускага з'езда 1917* у Мінску. Адзін з ініцыятараў абвяшчэння *Беларускай Народнай Рэспублікі* (БНР), нар. сакратар асветы ў 1-м яе ўрадзе. Пасля распаду БСГ разам з інш. бел. дзеячамі ў крас. 1918 арганізаваў *Беларускую сацыял-дэмакратычную партыю*, аўтар праекта яе праграмы, адзін з тэарэтыкаў бел. *сацыял-дэмакратыі*. У час паўторнага наступлення палякаў на Беларусь (вер. 1920) пераехаў у Вільню, удзельнічаў у стварэнні *Таварыства беларускай школы* і быў яго першым старшынёй. У жн. 1922 урад Сав. Беларусі дазволіў С. вярнуцца ў Мінск і прызначыў яго заг. планава-эканам. аддзела Наркамата земляробства БССР. Адначасова з 1923 дацэнт, праф. і заг. кафедры ў БДУ і Інбелкульце (з 1925 нам. яго старшыні, кіраўнік с.-г. секцыі і камісіі па раянаванні БССР). У 1924 пад яго кіраўніцтвам створаны час. «Плуг» і Цэнтр. бюро краязнаўства. У 1928 абраны правадз. членам Рус. геагр. т-ва, узнагароджаны (1930) яго Малым залатым

медалём за навук. працы «Размяшчэнне насельніцтва па тэрыторыі БССР» і «Сельскагаспадарчыя раёны БССР у 1927—1928 гг.: Папярэдняя схема і метадалагічныя ўвагі» (абедзве 1929). Аўтар вучэбнага дапаможніка «Геаграфія Беларусі» (1919; 4-е выд., 1993), які адкрываўся эпіграфам «Каб Беларусь перастала быць краем, невядомым для саміх беларусаў». С. зрабіў уклад у пераўтварэнне Інбелкульта ў Акадэмію навук Беларусі, быў адным з аўтараў яе першага статута. 26.6.1930 арыштаваны ДПУ па справе т.зв. *Саюза вызвалення Беларусі*. Паводле пастановы калегіі АДПУ СССР ад 10.4.1931 сасланы на 5 гадоў у г. Аса Пермскай, потым — у г. Ішым Цюменскай абл. (Расія). У жн. 1935 вызвалены, але 17.6.1937 зноў арыштаваны і 10.6.1938 прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Рэабілітаваны па 1-м прыгаворы Вярх. судом БССР 10.6.1988, па 2-м прэзідыумам Цюменскага абл. суда 9.2.1957.

Літ.: Л і с А. Цяжкая дарога свабоды. Мн., 1994. *У.М.Міхнюк.*

СМО́ЛІЧ Дзмітрый Мікалаевіч (11.4.1919, С.-Пецярбург — 28.4.1987), оперны рэжысёр. Сын М.В.*Смоліча*. Засл. дз. маст. Грузіі (1954), засл. дз. маст. Расіі (1958). Нар. арт. Украіны (1960). Нар. арт. Беларусі (1964). Нар. арт. СССР (1979). Скончыў оперна-драм. студыю імя К.Станіслаўскага ў Маскве (1941). Працаваў у оперных т-рах СССР. У 1962—69 гал. рэжысёр Дзярж. т-ра оперы і балета Беларусі. Спектаклям С. ўласцівы падпарадкаванасць усіх элементаў агульнай маст. задуме, майстэрства арганізацыі масавых сцэн. На бел. сцэне паставіў спектаклі: «Заручыны ў манастыры» С.Пракоф'ева, «Джаконда» А.Панк'елі, «Кето і Катэ» В.Далідзе (усе 1962), «Атэла» Дж.Вердзі, «Арэстэя» С.Танеева (абодва 1963), «Севільскі цырульнік» Дж.Расіні, «Яснае світанне» А.Туранкова (абодва 1964), «Кастрычнік» В.Мурадэлі (1965), «Князь Ігар» А.Барадзіна, «Брэсцкая крэпасць» К.Малчанава, «Алеся» Я.Цікоцкага (усе 1967), «Багема» Дж.Пучыні, «Калі ападае лісце» Ю.Семянякі (абодва 1968), «Травіята» Вердзі (1969). Дзярж. прэмія Украіны 1971. Дзярж. прэмія Грузіі 1972. *Дз.М.Жураўлёў.*

СМО́ЛІЧ Мікалай Васілевіч (24.6.1888, С.-Пецярбург — 31.7.1968), расійскі рэжысёр. Нар. арт. СССР (1944). Скончыў курсы пры Пецярбургскім тэатр. вучылішчы (1911). У 1911—17 акцёр Аляксандрынскага т-ра ў Петраградзе. З 1916 драм. рэжысёр, з 1922 рэжысёр (у 1924—30 гал. рэжысёр і дырэктар) Ленінградскага Малога опернага т-ра, з 1930 гал. рэжысёр, у 1947—48 рэжысёр Вял. т-ра ў Маскве, у 1938—47 гал. рэжысёр, маст. кіраўнік і дырэктар Т-ра оперы і балета ў Кіеве. У 1961—63 выкладаў у Маскоўскай кансерваторыі. Яго пастаноўкам уласцівы наватарская накіраванасць рэжысуры. Упершыню паст. оперы «Нос» і «Лэдзі Макбет Мцэнскага павета» («Кацярына Ізмайлава») Дз.Шастаковіча, «Імяніны» В.Жалабінскага, «Вяселле Крачынскага» А.Пашчанкі. На сцэне Дзярж. т-ра оперы і балета Беларусі паставіў оперу «Ціхі Дон» І.Дзяржынскага (1938).

Літ.: К и с е л е в В. Н.В.Смолич // Мастера Большого театра: Нар. артисты СССР. М., 1976.



Дз.М.**Смоліч**.



М.В.**Смоліч**.

СМО́ЛІЧ Юрый Карнеевіч (8.7.1900, г. Умань Чаркаскай вобл., Украіна — 26.8.1976), украінскі пісьменнік. Герой Сац. Працы (1970). Вучыўся ў Кіеўскім камерцыйным ін-це (1917—18). Друкаваўся з 1917. Пачынальнік прыгодніцкага і навук.-фантаст. жанраў ва ўкр. л-ры: раман «Апошні Эйджавуд» (1926), раман-памфлет «Сорак восем гадзін» (1933), зб. апавяд. «Прыгожыя катастрофы» (1935). Аўтар сатыр. кніг «Паўтара чалавека» (1927), «Фальшывая Мельпамена» (1928), «Па той бок сэрца» (1930), аўтабіягр. трылогіі «Дзяцінства», «Нашы тайны», «Васемнаццацігоддзе» (1936—38). У зб-ках апавяд. і нарысаў «Мірныя людзі», «Бітва» (абодва 1943), раманах «Яны не прайшлі» (1946), «Мы разам былі ў баі» (1948) тэма Вял. Айч. вайны. У кнігах «Пасля вайны» (1947), «Дзень пачынаецца рана» (1950), «Аб добрым у людзях» (з М.Рыльскім, 1965) пасляваен. жыццё, раманы «Світанне над морам» (1953), «Мір хацінам, вайна палацам» (1958), «Раве і стогне Днепр шырокі» (1960) пра грамадз. вайну на Украіне. Аўтар мемуараў «Аповед пра непакой...» (кн. 1—3, 1968—72), п'ес.

Тв.: Твори: В 8 т. Т. 1—6. Київ, 1983—85; Рус. пер. — Избранное. Т. 1—2. М., 1960.

Літ.: П и с к у н о в В. Юрий Смолич. М., 1961.

СМО́ЛКА, род кветкавых раслін, тое, што *смалянка*.

СМО́ЛЫ, сумесь арганічных, пераважна высокамалекулярных злучэнняў прыроднага паходжання (прыродныя С.) або штучна атрыманых (сінт. С.).

С. п р ы р о д н ы я, ці натуральныя — прадукты жыццядзейнасці некат. раслін (пераважна трапічных і хвойных), што назапашваюцца ў каналах іх ствалоў, каранёў і інш. органаў. З'яўляюцца асн. кампанентам вадкасцей (*жывіцы* хвойных і *бальзамаў* трапічных раслін), якія вылучаюцца на паверхні кары раслін самаадвольна або пры яе мех. пашкоджанні ў перыяд вегетацыі (гл. *Падсочка*). Некат., т.зв. выкапнёвыя С., здабываюць з зямлі (напр., *бурштын*). С. — афарбаваныя (ад жоўтага да цёмна-рудога колеру) шклопадобныя рэчывы, плавяцца пры награванні, не растараюцца ў вадзе, растваральніках, здольныя да плёнкаўтварэння (гл. *Плёнкаўтваральныя рэчывы*). Асн. кампаненты раслінных С.: *смаляныя кіслоты*, рэзінолы — адна- або шмататамныя спірты, эфіры смаляных кіслот і рэзінолаў ці аднаатамных фенолаў, рэзены — інертныя вуглевадароды (напр., у бурштыне іх да 70%). Найб. пашыраныя прыродныя С. — акароід, бурштын, дамара, *каніфоль*, капалы, *масцікс*, сандарак, шэлак. У прам-сці выкарыстоўваюць пераважна каніфоль, а таксама капалы (кампанент атмасфераустойлівых алейных лакаў), шэлак (кампанент мэблевых спіртавых лакаў і палітур) і бурштын. С. с і н т э т ы ч н ы я — тэрмарэактыўныя сінт. алігамеры, здольныя пры перапрацоўцы ў выніку ацвярдзення ператварацца ў нераствараль ныя і няплаўкія прадукты (гл. *Ацвярдзенне палімераў*). Асн. метад іх сінтэзу — *поліканджсацыя*. Да сінт. С. адносяцца *алкідныя смолы, амінальдэгідныя смолы, поліэфірныя смолы, фенола-фармальдэгідныя смолы, эпаксідныя смолы*. У прам-сці С. сінт. замяняюць прыродныя. Выкарыстоўваюць як плёнкаўтваральнікі лакафарбавых матэрыялаў, сувязнае для пластмас, герметыкаў і кляёў, для апрэтавання тканін, праклейвання паперы і інш. Гл. таксама *Драўнінная смала, Каменнавугальная смала*. *Я.Г.Міляшкевіч.*

СМО́ЛЬКА (Smolka) Станіслаў (29.6.1854, г. Львоў, Украіна — 27.8.1924), польскі гісторык. Д-р габілітаваны (1875), правадз. чл. АН у Кракаве (1884). Вучыўся ва ун-тах Львова і Гётынгена. У 1877—1902 выкладаў у Кракаўскім ун-це, у 1895—96 яго рэктар. З 1902 дырэктар Архіва гродскіх і земскіх актаў у Кракаве. У 1918—24 праф. Каталіцкага ун-та ў Любліне. Даследаваў гісторыю Польшчы 12—19 ст., гісторыю ВКЛ і яго уніі з Польшчай, гістарыяграфію. Гісторыя Беларусі асвятляецца ў працах «1386 год...» (1886; 2-е выд. 1903 мае назву «Унія Літвы з Каронай»), «Кейстут і Ягайла» (1889) і інш. У кн. «Найдаўнейшыя помнікі руска-літоўскай гістарыяграфіі: Крытычны разбор» (1889) даследаваў бел.-літ. летапісы.

СМО́ЛЬНЫ, помнік архітэктуры ў С.-Пецярбургу; архітэктурны ансамбль 18—19 ст. Уключае комплекс б. манастыра і ін-та шляхетных дзяўчат. У пач. 18 ст. на тэр. С. быў Смаляны двор, дзе выраблялі смалу для флоту (адсюль назва). У 1748—64 тут пабудаваны Смольны (Уваскрэсенскі) жаночы манастыр у стылі барока (арх. В.В.Растрэлі; інтэр'ер і корпус келляў, 1832—35, арх. В.Стасаў). У яго цэнтры — сабор, абкружаны корпусам келляў і 4 вуглавымі цэрквамі. Непадалёку ад манастыра велічны, строгі па формах будынак Смольнага ін-та шляхетных дзяўчат (1806—08, арх. Дж.Кварэнгі, класіцызм) — першая ў Расіі жаночая агульнаадук. навучальная ўстанова (1764—1917). У 1920-я г. пры ўдзеле арх. У.Шчуко і У.Гельфрэйха перад будынкам ін-та ўзведзены класіцыстычныя прапілеі і рэгулярны сад. У 1917 у С. знаходзіўся Петраградскі савет і ВРК. Цяпер адм. ўстанова.

СМО́ЛЬСКІ Аляксандр Браніслававіч (н. 25.5.1952, Мінск), бел. кампазітар. Сын Б.С.*Смольскага*. Скончыў Бел. кансерваторыю (1977, кл. Я.*Глебава*), у 1972—81 працаваў у ёй. З 1991 у Бел. ун-це культуры. Працуе ў розных жанрах. Музыцы ўласцівы меладызм, экспрэсіўнасць, яркасць аркестроўкі, арган. спалучэнне фальклю. пачатку з сучаснымі выразнымі сродкамі. Сярод твораў: опера «Крэпасць» (1990), аперэта «Вясенняя серэнада» (канцэртнае выкананне 1987), творы для сімф. аркестра, нар. аркестра, у т.л. «Канцэрт-паэма для цымбалаў і аркестра» (1986), творы для фп., вак. цыклы і інш. *Л.А.Лявонава.*

СМО́ЛЬСКІ Бекір Міхайлавіч (12.7.1913, Мінск — 28.9.1982), бел. вучоны ў галіне цеплафізікі. Чл.-кар. АН Беларусі (1967), д-р тэхн. н. (1958), праф. (1961). Скончыў БПІ (1935) і працаваў там з 1946. З 1958 заг. лабараторыі, з 1959 нам. дырэктара, з 1971 заг. лабараторыі Ін-та цепла- і масаабмену АН Беларусі. Навук. працы па прамысл. цеплаэнергетыцы, ачыстцы газавых прамысл. выкідаў, метадах цеплавільготнай апрацоўкі матэрыялаў, працэсах пераносу цеплаты і рэчыва ва ўмовах вакууму, вызначэнні аптымальных умоў інтэнсіфікацыі сублімацыйнага абязводжвання капілярна-порыстых рэчываў, вывучэнні ўплыву тэрмадыфузіі пры тэрмічнай апрацоўцы капілярна-порыстых матэрыялаў.

Тв.: Внешний тепло- и массообмен в процессе конвективной сушки. Мн., 1957; Реодинамика и теплообмен нелинейно вязкопластичных материалов. Мн., 1970 (разам з З.П.Шульманам, В.М.Гарыславец); Нестационарный теплообмен. Мн., 1974 (разам з Л.А.Сяргеевай, У.Л.Сяргеевым).

СМО́ЛЬСКІ Браніслаў Сільвестравіч (н. 19.3.1909, Мінск), бел. музыказнавец. Канд. мастацтвазнаўства (1969). Засл. дз. маст. Беларусі (1979). Скончыў Маскоўскую кансерваторыю (1936), Дзярж. ін-т тэатр. мастацтва імя А.Луначарскага (1960). У 1928—29 муз. рэдактар Белрадыёцэнтра. Выкладаў у Бел. (1936—41) і Узб. кансерваторыях. У 1943—82 працаваў ва Упраўленні па справах мастацтваў СМ Беларусі, ін-тах л-ры і мастацтва, мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН Беларусі. Даследчык гісторыі бел. муз. т-ра і бел. муз. культуры. Аўтар кн. «Беларуская музыка за 40 гадоў» (1957), «Беларускі музычны тэатр», «Беларускі дзяржаўны ордэна Леніна Вялікі тэатр оперы і балета» (абедзве 1963), раздзелаў у кн. «Гісторыя беларускай савецкай музыкі» (1971), «Гісторыя музыкі народаў СССР» (т. 1—5, 1970—74), артыкулаў пра творчасць бел. спевакоў, рэцэнзій на муз. спектаклі і інш. *Т.А.Дубкова.*



Б.М.**Смольскі**.



Дз.Б.**Смольскі**.

СМО́ЛЬСКІ Дзмітрый Браніслававіч (н. 25.7.1937, Мінск), бел. кампазітар, педагог. Сын Б.С.*Смольскага*. Засл. дз. маст. Беларусі (1976). Нар. арт. Беларусі (1987). Скончыў Бел. кансерваторыю (1960). Вучань М.Пяйко, Ю.Фартунатава, А.Эйгеса. З 1962 выкладае ў Бел. акадэміі музыкі (з 1986 праф.). Творам уласцівы прыхільнасць да паглыбленай псіхалагічнасці вобразаў, экспрэсіўнасць, сістэмнасць кампазіцыйных сродкаў, што вылучае адметнасць яго творчасці ў сучасным муз. мастацтве. Значныя дасягненні ў розных жанрах (сімфонія, опера, араторыя і інш.) абумоўлены своеасаблівасцю творчай задумы і маст. дасканаласцю яе ўвасаблення з выкарыстаннем індывідуальна асэнсаваных сродкаў музыкі. Сярод твораў: оперы «Сівая легенда» (паст. 1978), «Францыск Скарына» (паст. 1980); араторыі «Мая Радзіма» (1970), «Паэт» (1980), камерная араторыя «Песні Хірасімы» (1966); вак.-сімф. цыкл «Бабін век», 10 сімфоній (1961—99), канцэрты для фп. (1995), цымбалаў (1961, 1974, 1983), канцэрціны для скрыпкі (1972) і віяланчэлі (1973), вак. цыклы, у т.л. на вершы Я.Купалы, Цёткі, Г.Ахматавай, А.Вазнясенскага, Я.Палонскага, Б.Пастарнака, М.Цвятаевай, Ф.Цютчава, Ф.Гарсія Лоркі; хар. цыкл на верш М.Танка, рамансы, песні, музыка да кінафільмаў, драм. спектакляў і інш. Сярод вучняў А.*Бандарэнка*, Г.*Гарэлава*, У.*Дамарацкі*, У.*Кур'ян*. Прэмія Ленінскага камсамола Беларусі 1972. Дзярж. прэмія Беларусі 1980.



М.У.**Смольскі**.



Р.Б.**Смольскі**.

Літ.: Ауэрбах Л.Д. Д.Смольский // Ауэрбах Л.Д. Белорусские композиторы. М., 1978; Сергіенка Р.І. Восьмая сімфонія Дз. Смольскага: Погляд на кампазіцыю і драматургію // Пытанні культуры і мастацтва Беларусі. Мн., 1994. Вып. 13; Аладова Р. Откровения Дмитрия Смольского // Муз. академия. 2000. № 2. *Т.А.Дубкова.*

СМО́ЛЬСКІ Мікалай Уладзіслававіч (7.10.1905; г. Нароўля Гомельскай вобл. — 29.4.1976), бел. вучоны ў галіне батанікі. Акад. АН Беларусі (1969, чл.-кар. 1956), д-р біял. н. (1967), праф. (1969). Акад. АН Таджыкістана (1951). Засл. дз. нав. Беларусі (1972). Скончыў Горы-Горацкі с.-г. ін-т (1924), Сібірскую с.-г. акадэмію (1927). З 1945 дырэктар Усесаюзнага НДІ сухіх субтропікаў (Душанбе), з 1955 дырэктар Цэнтр. бат. сада АН Беларусі. Навук. працы па вывучэнні фісташкавых саваннаў, шаўкоўніцы і пладовых Сярэдняй Азіі, па інтрадукцыі і селекцыі субтрапічных культур у зонах вільготных і сухіх субтропікаў СССР. Распрацаваў тэарэт. асновы інтрадукцыі і акліматызацыі карысных раслін, зялёнага буд-ва, аховы прыроды і ўзнаўлення прыродных рэсурсаў Беларусі. Дзярж. прэмія Беларусі 1978.

Тв.: Деревья и кустарники, розы и сирень. Мн., 1968 (у сааўт.); Новые перспективные для Белоруссии кормо-силосные растения. Мн., 1970 (у сааўт.); Многолетние цветочные растения. Мн., 1972 (у сааўт.).

СМО́ЛЬСКІ Рычард Баляслававіч (н. 3.4.1946, г. Ліда Гродзенскай вобл.), бел. тэатразнавец, педагог. Д-р мастацтвазнаўства (1991), праф. (1999). Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1970). Працаваў на кінастудыі «Беларусьфільм», з 1976 у Ін-це мастацтвазнаўства, этна-



Ансамбль **Смольнага** ў С.-Пецярбургу.

графіі і фальклору Нац. АН Беларусі (з 1988 заг. аддзела), адначасова з 1997 рэктар Бел. АМ. Даследуе праблемы рэжысуры, акцёрскай творчасці, сцэнічнай гераікі, рус. тэатр. культуры на Беларусі. Аўтар кніг «Пазначана часам: Пошукі сучаснай беларускай рэжысуры» (1984), «Стварэнне лёсу: Гістарычная і гераіка-рэвалюцыйная тэма ў тэатрах Беларусі 70—80-х гг.» (1987), «На скрыжаванні: Тэатр у працэсах станаўлення і развіцця гістарычнай і нацыянальнай свядомасці беларусаў» (1999), «Рэха мінулага: Тэатразнаўчыя эцюды аб беларускай культуры XX ст.» (2000); раздзелаў «Гісторыі беларускага тэатра» (т. 2—3, 1985—87); п'ес (з Ю.Сохарам) «Разбег» (1974), «Выкупленне» (1976), «Не толькі пра каханне» (паст. 1978); радыёп'есы «Лёс, які мы выбіраем» (паст. 1986); сцэнарыяў дакумент. фільмаў «Марыя» (1975); «Праз усё жыццё» (1978, пра Е.Міровіча), «Уладзіслаў Галубок» (1982); «Жыццё кліча» (1984, пра У.Крыловіча), «Антракт» (1992, пра М.Яроменку; з В.Навуменкам).

Тв.: На сцене — бессмертие подвига. Мн., 1982; Грядущим в наследство: Тема Великой Отеч. войны в бел. театре 80-х гг. Мн., 1986; Тэатр у прасторы часу: Мастацтвазнаўчыя арт., рэц., творчыя партрэты. Мн., 1998.

Т.Я.Гаробчанка.

СМО́ЛЬЧЫЦКІЯ КАНГЛАМЕРА́ТЫ, геалагічны помнік прыроды рэсп. значэння (з 1997). Размешчаны за 1,4 км на Пн ад в. Забалацце Карэліцкага р-на Гродзенскай вобл. Назва ад былой в. Смольчыцы. 15 камлыг (даўж. больш за 3 м), з іх найб. даўж. 11,8 м, шыр. 6,2 м, выш. 7,8 м, у абводзе 23,7 м, аб'ём 303 м^3, маса каля 802 т. Утварыліся ў выніку цэментацыі карбанатным растворам водна-ледавіковых пясчана-жвірова-галечных і пясчана-жвіровых з валунамі адкладаў, што чаргуюцца паміж сабой (магутнасць слаёў 0,1—1,5 м). С.к. — эталон карбанатных новаўтварэнняў.

В.Ф.Вінакураў.



Адзін са **Смольчыцкіх канглamератаў**

СМУГА́ атмасферная, слабае памутненне паветра каля зямной паверхні. Выклікаецца рассеяннем святла на завіслых драбнюткіх кропельках вады або крышталях лёду. Бачнасць пры С. больш за 1 км (пры тумане — да 1 км). У свабоднай атмасферы С. — слабае памутненне паветра (пачатковы воблачны слой), звязанае з прадуктамі кандэнсацыі вадзяной пары.



Ф.**Смуглевіч**. Аўтапартрэт.

СМУГЛЕ́ВІЧ Францішак (6.10.1745, Варшава — 18.9.1807), жывапісец, графік, педагог; прадстаўнік класіцызму. Творчасць звязана з маст. жыццём Польшчы, Літвы, Беларусі, Расіі. Вучыўся ў бацькі Л.Смуглевіча і Ш.Чаховіча. У 1763—84 у Рыме, вучыўся ў А.Марана, з 1766 у акадэміі св. Лукі; разам з В.Брэна размалёўваў золатам гроты. У 1784—97 у Варшаве, у 1797—1807 праф. жывапісу і малюнка ў Віленскім ун-це. Удзельнічаў у размалёўцы інтэр'ераў Міхайлаўскага палаца ў Пецярбургу (1800—01; не зберагліся), аформіў т.зв. залу Смуглевіча ў б-цы Віленскага ун-та (разам з братам Антоніем), выканаў шэраг станковых карцін і манум. размалёвак у храмах Беларусі (Мінск, Гродна, Полацк, Рэчыца і інш.), Літвы і Польшчы. Працаваў у жанрах гіст., батальным, партрэта, стварaў алегарычныя і міфалагічныя кампазіцыі. Сярод твораў: «Смерць Марыі» (1784), «Св. Іаан-Хрысціцель», «Прыгавор аб выгнанні Арыстыда», «Перамога Аляксандра над Дарыем», «Юдзіф», «Бітва каля Берасцечка ў 1651», «Развітанне апосталаў Пятра і Паўла» (1805), «Персідскія паслы ў караля Марока», «Пасольства скіфаў у Дарыя», «Бітва пры Хаціне ў 1673», «Польскія сяляне за сталом», «Літоўскія сяляне», «Прысяга Т.Касцюшкі на Кракаўскім рынку», «Уступленне Баляслава Храбрага ў Кіеў», «Сяляне ў нацыянальным адзенні», «Сцэна з сялянскага жыцця»; партрэты Ю.Пешкі, Р.Пшаздзецкага, сям'і Тышкевічаў, епіскапа Гедройца, старой жанчыны, сям'і К.Прозар, аўтапартрэт і інш. Афармляў кнігі, выканаў каля 150 малюнкаў. Сярод яго вучняў мастакі І.*Аляшкевіч*, Ю.*Пешка*.

Літ.: Дробов Л.Н. Живопись Белоруссии XIX—XX в. Мн., 1974. *Л.Н.Дробаў.*

СМУЛКО́ВА (Smułkowa) Яніна Эльжбета (н. 24.6.1931, г. Львоў, Украіна), польскі мовазнавец. Скончыла аддзяленне польскай і слав. філалогіі ун-та імя М.Каперніка ў г. Торунь (1955). З 1957 у Варшаўскім ун-це (з 1988 праф.); адначасова ў 1957—61 працавала ў Ін-це славяназнаўства Польскай АН. З 1991 ген. консул, у 1992—95 Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Польшча ў Рэспубліцы Беларусь. З 1997 выкладае ва ун-це ў Беластоку, кіраўнік кафедры бел. культуры. Даследуе бел. і параўнальную слав. дыялекталогію, бел. і ўсх.-слав. акцэнталогію, тэорыю і практыку моўных кантактаў на польска-бел.-літоўскім пагранічча, бел. і агульную фанетыку і фаналогію. Аўтар прац «Гаворкі ўсходняй Беласточчыны ў святле лексічных даследаванняў» (1972), «Да пытання аб прадказальнасці ўсходнеславянскага націску» (1976), «Аб польска-беларускіх моўных саюзах у аспекце часавым і тэрытарыяльным» (1988), «Беларуска-літоўска-польскае этналінгвіс-



Ф.**Смуглевіч**. Персідскія паслы ў караля Марока.

тычнае пагранічча. Сучасныя праблемы» (1993), «Беларускія элементы ў творчасці А.Міцкевіча» (1998), «Моўнае пагранічча як прадмет сучаснай дыялекталогіі» (2001) і інш. Удзельнічала ў стварэнні канцэпцыі, зборы матэрыялаў і падрыхтоўцы «Атласа ўсходнеславянскіх гаворак Белasточчыны» (т. 1—3, 1980—93), «Слоўніка беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яе пагранічча» (т. 1—5, 1979—86), «Слоўніка мікратапонімаў паўночна-ўсходняй Польшчы» (т. 1—2, 1992—95) і інш. Чл. Міжнар. асацыяцыі беларусістаў.

Тв.: Słownictwo z zakresu uprawy roli w gwarach wschodniej Białostocczyzny na tle wschodniosłowiańskim. T. 1—2. Warszawa; Kraków, 1968; Studia nad akcentem języka białoruskiego: (Rzeczownik). Warszawa, 1978; Fonetyka i fonologia języka białoruskiego z elementami fonetyki i fonologii ogólnej. Warszawa, 1988 (разам з В.М.Чэкманам); Białoruś i Pogranicza: Studia o języku i społeczeństwie. Warszawa, 2002.

А.С.Аксамітаў.

СМУ́ТА, С м у т н ы ч а с, тэрмін рас. гістарыяграфіі для абазначэння падзей гасп., сац.-паліт. і дынастычнага крызісу ў Расіі канца 16 — пач. 17 ст., які быў узмоцнены замежным ваен.-паліт. умяшаннем. У сав. гістарыяграфіі ўжываліся тэрміны «Сял. вайна пач. 17 ст.», «Польская і швед. інтэрвенцыя пач. 17 ст.». Сучасныя рас. гісторыкі разглядаюць падзеі пач. 17 ст. як грамадз. вайну, у якую былі ўцягнуты ўсе сац. групы і пласты: у фазу адкрытай узбр. барацьбы перайшлі вострыя антаганізмы паміж феадаламі і сялянамі, якія супраціўляліся запрыгоньванню (гл. *Запаветныя гады*); паміж казацтвам і дваранствам, дваранствам цэнтра і ўскраін, якія змагаліся за ўладу і ўплыў у краіне. Рэч Паспалітая і Швецыя імкнуліся выкарыстаць унутрырас. крызіс для вяртання страчаных у папярэдніх войнах зямель. У 1598 памёр апошні прадстаўнік дынастыі маскоўскіх *Рурыкавічаў* цар (з 1584) *Фёдар Іванавіч*. Становішча выбранага Земскім саборам цара *Барыса Гадунова* [1598—1605] было складаным, бо яго падазравалі ў забойстве царэвіча *Дзмітрыя Іванавіча*. Неўраджай і масавы голад 1601—03 пагоршылі жыццёвыя ўмовы ўсіх пластоў грамадства, асабліва сялян, што прывяло да буйных хваляванняў пад заклікам звяржэння Гадунова і перадачы ўлады «законнаму цару Дзмітрыю Іванавічу», якому нібыта ўдалося выратавацца. У 1604 пад імем царэвіча Дзмітрыя Іванавіча з поўдня ў межы Расіі, пры падтрымцы Рэчы Паспалітай, уступіў самазванец *Лжэдзмітрый I*, якога падтрымала ч. баярства і гараджан. Пасля раптоўнай смерці Барыса Гадунова (1605) і забойства яго сына Фёдара Лжэдзмітрый I заняў прастол. У 1606 ён забіты змоўшчыкамі на чале з кн. *Васілём Іванавічам Шуйскім*, які быў выбраны новым царом [1606—10]. Шуйскі задушыў *Балотнікава паўстанне 1606—07*, якое адбывалася пад заклікам перадачы ўлады «зноў выратаванаму» Дзмітрыю Іванавічу. Летам 1607 з'явіўся новы самазванец *Лжэдзмітрый II*, падтрыманы атрадамі магнатаў і шляхты Рэчы Паспалітай, а таксама данскімі казакамі на чале з І.М.Заруцкім. Летам 1608 ён асадзіў Маскву і авалодаў суседнімі землямі. На бок самазванца перайшла ч. баяр, дваран і духавенства. У лют. 1609 Шуйскі звярнуўся па дапамогу да Швецыі, якой прапанаваў узамен рас. землі з крэпасцямі Ям, Капор'е і Карэла. Кн. М.В.*Скапін-Шуйскі* ў 1609—10 пры падтрымцы швед. атрадаў нанёс паражэнні прыхільнікам Лжэдзмітрыя II і зняў аблогу з Масквы. Саюз Расіі са Швецыяй, з якой Рэч Паспалітая была ў стане вайны, стаў зачэпкай для развязвання *вайны Рэчы Паспалітай з Расіяй 1609—18*. У гэтай вайне В.Шуйскі пацярпеў паражэнне і ў ліп. 1610 скінуты з трона баярскай групоўкай. Улада перайшла да т.зв. *сямібаяршчыны*, па ініцыятыве якой царом выбраны польскі каралевіч Уладзіслаў (гл. *Уладзіслаў IV*); Маскву заняў польска-літ.-бел. гарнізон. Летам 1610 адкрытую інтэрвенцыю пачала Швецыя, яе войскі ў 1611 занялі Карэлу і Ноўгарад, у 1612 — Ям, Капор'е, Арэшак, Ладагу, інш. гарады і крэпасці. Патрыят. рух пад заклікам выгнання іншаземцаў і выбрання «спрадвечнага» цара прывёў да фарміравання *Першага апалчэння 1611*, потым *Народнага апалчэння 1612* пад кіраўніцтвам К.*Мініна* і Дз.*Пажарскага*, якое восенню 1612 вызваліла Маскву. У сак. 1613 земскі сабор выбраў царом *Міхаіла Фёдаравіча* Раманава, які паклаў пачатак дынастыі *Раманавых*. У 1613—14 на Доне і Ніжняй Волзе задушаны казацка-сял. рух Заруцкага, які прапаноўваў на рас. прастол малалетняга «царэвіча» Івана — сына М.Мнішак (дачка польскага магната, жонка Лжэдзмітрыя I, а потым і Лжэдзмітрыя II). Паводле *Сталбоўскага міру 1617* Швецыя пакінула за сабой Іжорскую зямлю і г. Карэла з паветам, Расія страціла выхад да Балт. мора. У 1617—18 адбіта спроба войск Рэчы Паспалітай захапіць Маскву. Паводле *Дэулінскага перамір'я 1618* Расія ўступіла Рэчы Паспалітай б.ч. Смаленшчыны, Чарнігаўшчыну, Ноўгарад-Северскія і некат. інш. землі. Такім чынам, да пач. 1620-х г. рас. народ цаной вял. ахвяр у асн. пераадолеў С. і адстаяў сваю нац. дзяржаўнасць. Узмацнілася ідэя самадзяржаўя, пашырыліся настроі ізаляцыянізму, узрасло значэнне правасл. каштоўнасцей.

Літ.: А б р а м о в и ч Г.В. Князья Шуйские и Российский трон. Л., 1991; З и м и н А.А. Канун грозных потрясений: Предпосылки первой крестьянской войны в России. М., 1986; К а р а м з и н Н.М. История государства Российского. Кн. 3, т. 9—12. М., 1989; К л ю ч е в с к и й В.О. Соч.: В 9 т. Т. 3. Курс русской истории, ч. 3. М., 1988; К о с т о м а р о в Н.И. Смутное время Московского государства в начале XVII столетия, 1604—1613. М., 1994; П л а т о н о в С.Ф. Очерки по истории смуты в Московском государстве, XVI—XVII вв. 5 изд. М., 1995; Я г о ж. Смутное время. СПб., 2001; С к р ы н н и к о в Р.Г. Россия накануне «смутного времени». М., 1980; Я г о ж. Социально-политическая борьба в Русском государстве в начале XVII в. Л., 1985; Я г о ж. Смута в России в начале XVII в.: Иван Болотников. Л., 1988; Я г о ж. Самозванцы в России в начале XVII в.: Григорий Отрепьев. 2 изд. Новосибирск, 1990; Смута в Московском государстве. М., 1989; С о л о в ь е в С.М. Соч.: В 18 кн. Кн. 4. История России с древнейших времен, т. 7—8. М., 1989.

С.В.Пазняк.



Ю.**Смуул**.



Я.У.**Смушкевіч**.

СМУ́УЛ (Smuul) Юхан (18.2.1922, в. Когува на в-ве Муху, Эстонія — 13.4.1971), эстонскі пісьменнік. Нар. пісьменнік Эстоніі (1965). Друкаваўся з 1943. Аўтар зб-каў вершаў «Суровае юнацтва» (1946), «Брыгада хлопцаў з Ярвесуу» (1948), «Каб яблыні цвілі», «Вершы. Паэмы» (абодва 1951; за апошні Дзярж. прэмія СССР 1952), паэм «Сын буры» (1947), «Я — камсамолец» (1953) і інш. Нарысы і навелы з жыцця калг. вёскі ў зб. «Лісты з сяла Сыгедатэ» (1955). Найб. значны твор — дзённік падарожжа ў Антарктыду «Лядовая кніга» (1958, Ленінская прэмія 1961). Да яго блізкая аповесць «Японскае мора, снежань» (1963). Аўтар п'ес «Атлантычны акіян» (паст. 1956), «Леа» (1959), «Кіхнускі Йынь, або Дзікі капітан» (паст. 1964), «Удава палкоўніка» (паст. 1966), «Жыццё пінгвінаў» (1969), сатыр. «Маналогаў» (1968) і інш. На бел. мову асобныя яго вершы перакладалі В.Вітка, В.Дашкевіч, В.Зуёнак, В.Шымук, аповесці — С.Міхальчук.

Тв.: Бел. пер. — Мурка-марак. Мн., 1979; Рус. пер. — Морские песни: Стихи и поэмы. М., 1963; Ледовая книга; Монологи. М., 1972; Пьесы. М., 1974.

Літ.: С у р о в ц е в Ю. Юхан Смуул. М., 1964.

СМУ́ШАК, шкурка ягняці смушкавай пароды, якое было забіта ў першыя суткі (да 3) пасля нараджэння. Падзяляюць на каракульскія (гл. *Каракуль*) і некаракульскія С. (ад інш. смушкавых парод — сакольскай, рэшацілаўскай, шыразскай і інш.). Найб. каштоўныя характарызуюцца шчыльнай, тонкай мяздрою, шаўкавістым валасяным покрывам, добрым бляскам, валькаватымі (паўкруглымі) і бобападобнымі завіткамі. Выкарыстоўваецца для футравых вырабаў.

СМУШКЕ́ВІЧ Якаў Уладзіміравіч (14.4.1902, г. Рокішкіс, Літва — 28.10.1941),

савецкі военачальнік. Двойчы Герой Сав. Саюза (1937, 1939). Ген.-лейт. авіяцыі (1940). Вучыўся ў БДУ (1923—25), скончыў Качынскую школу ваен. лётчыкаў (1932), курсы ўдасканалення камсаставу пры Ваен. акадэміі імя Фрунзе (1937). З 1918 у Чырв. Арміі. З 1919 на Зах. фронце, удзельнік сав.-польскай вайны 1920, баёў пад Баранавічамі, узяцця Смаргонскага ўмацаванага раёна. З 1922 у авіяцыі: камісар эскадрыллі (Мінск), камісар, нач. палітаддзела, камандзір авіябрыгады ў Віцебску (1926—36). Удзельнік баёў у Іспаніі 1936—37 на баку рэспубліканцаў. З чэрв. 1937 нам. нач. ВПС РСЧА. У 1939 камандаваў авіягрупай у час баёў на р. Халхін-Гол. Удзельнік паходу Чырв. Арміі ў Зах. Беларусь у 1939, сав.-фінл. вайны 1939—40. З ліст. 1939 нач. ВПС РСЧА, са жн. 1940 ген. інспектар ВПС РСЧА, са снеж. 1940 пам. нач. Ген. штаба па авіяцыі. Канд. у чл. ЦК ВКП(б) у 1939—41, чл. ЦК КП(б)Б у 1932—34. Чл. ЦВК БССР у 1935—36. Дэп. Вярх. Савета СССР з 1937. У чэрв. 1941 арыштаваны. 28.10.1941 пакараны смерцю. Рэабілітаваны ў 1954.

Літ.: Люди бессмертного подвига. Кн. 2. 4 изд. М., 1975; Зильманович Д.Я. На орбите большой жизни. Вильнюс, 1971; Водопьянов М.В., Григорьев Г.К. Летать рожденный. М., 1969. *Б.Дз.Далгатовіч.*

СМЫК, у беларусаў прылада для рыхлення глебы і загортвання ў яе насення. Выкарыстоўвалі часцей пры ляднай (падсечнай) сістэме земляробства ў лясных зонах. На Віцебшчыне, дзе доўга захоўвалася ляднай сістэма, сеялі без папярэднага ўзорвання, а С. або вершалінай (сукаваткай) адначасова рыхлілі глебу і засыпалі пасеянае насенне. С. рабілі з расколатых ці абчасаных яловых ствалоў, у якіх з аднаго боку пакідалі сукі даўжынёй 40—60 см. Колькасць ствалоў (5—10) была абумоўлена і таўшчынёй дрэўцаў, з якіх рабілі С., і ўмовамі працы. Для апрацоўкі цяжкіх глеб С. рабілі з больш тоўстых дрэўцаў з мацнейшымі сукамі. Ствалы даўжынёю каля метра прывязвалі дубовымі, лазовымі, бярозавымі віткамі да дзвюх папярочных планак, радзей прыбівалі цвікамі. Два крайнія ствалы былі на 1—1,5 м даўжэйшыя за сярэднія. Яны ўтваралі аглоблі, за якія чаплялі пастронкі. С. бытаваў на Беларусі паўсюдна, за выключэннем Гомельшчыны, да пач. 20 ст.; часам яго выкарыстоўвалі замест бараны. У некат. мясцовасцях, асабліва на Віцебшчыне, 7—10-ствольнымі С. баранавалі бульбу. *Л.І.Міньо.*



Смык.

СМЫСЛО́Ў Пётр Міхайлавіч (14.6.1827, Наўгародская губ., Расія — 18.12.1891), расійскі астраном і геадэзіст. Ген.-маёр. Чл. Рускага геагр. т-ва (1863), адзін з заснавальнікаў Рускага астр. т-ва (1890). З 1841 і з 1857 у Ваенна-тапагр. дэпо Генеральнага штаба. У 1844—51 і 1855—57 на астранома-геад. і гравіметрычных работах у Віцебскай, Наўгародскай і Пскоўскай губ. У 1860—66 у Пулкаўскай астр. абсерваторыі. У 1866—82 дырэктар *Віленскай астранамічнай абсерваторыі*. Навук. працы па вызначэнні геагр. даўгот хранаметрычнымі і інш. метадамі. У 1867—76 правадзіў сістэм. назіранні зацьменняў спадарожнікаў Юпітэра, у выніку чаго вызначыў каэфіцыент гадавой аберацыі святла (20′42″); займаўся фатаграфаваннем паверхні Сонца. Дзямідаўская прэмія 1864 за манаграфію «Рэпсольдаў круг. Хранометры. Хранаметрычная экспедыцыя 1859 г.» (1863).

Літ.: Шибанов Ф.А. Из истории практической астрономии, геодезии и картографии в России: П.М.Смыслов // Историко-астрономические исследования. М., 1966. Вып. 9; Библиография русской астрономической литературы 1800—1900 гг. М., 1968 (Тр. Гос. астроном. ин-та; Т. 37). *А.І.Болсун.*

СМЫЧО́К, ландшафтны заказнік рэсп. значэння ў Жлобінскім і Рэчыцкім р-нах Гомельскай вобл., у міжрэччы Дняпра і Бярэзіны. Засн. ў 2000 для аховы прыродных комплексаў з папуляцыямі рэдкіх і знікаючых відаў раслін і жывёл. Пл. 2,635 тыс. га. Рэльеф пласкахвалісты з эолавымі градамі і раўніннай прырэчышчавай поймай. У складзе заказніка 24 старычныя возеры. Лясы займаюць 35% пл. (пераважаюць дубровы, хвойнікі, чорнаалешнікі, асіннікі, зараснікі вярбы), балоты — 13%. У флоры 485 відаў вышэйшых раслін, з іх 5 відаў занесены ў Чырв. кнігу: вадзяны арэх плывучы, касач сібірскі, гарлачык белы, лікападыела заліўная, фіялка багнавая. У фауне 140 відаў наземных пазваночных жывёл, у т.л. 21 від млекакормячых (дзік, казуля, бобр, андатра, ліс, янотападобны сабака); 105 відаў птушак (12 відаў у Чырв. кнізе: малая паганка, вялікі бугай, чорны бусел, лебедзь-шыпун, гогаль звычайны, пустальга звычайная, каршачок, зімародак звычайны і інш.); багатая іхтыяфауна (у Чырв. кнізе 3 віды: ручаёвая стронга, рыбец, вусач); 121 від насякомых, у т.л. рэдкія: прыгажуня бліскучая, плывунец найшырэйшы, пераліўніца вялікая, перламутраўка балотная. *П.І.Лабанок.*

СМЫЧО́К Васіль Барысавіч (н. 24.12.1956, г. Славута Хмяльніцкай вобл., Украіна), бел. вучоны ў галіне неўрапаталогіі. Д-р мед. н. (1999), праф. (2000). Скончыў Чарнавіцкі мед. ін-т (1980). З 1985 у Мінскім мед. ін-це, з 1989 у Бел. НДІ медыка-сац. экспертызы і рэабілітацыі (з 1999 дырэктар), адначасова з 2000 у Бел. мед. акадэміі паслядыпломнай адукацыі (заг. кафедры). Навук. працы па стварэнні эфектыўнай комплекснай тэхналогіі рэабілітацыі хворых і інвалідаў.

Тв.: Черепно-мозговая травма: эпидемиология, инвалидность, реабилитация. Мн., 1998.

СМЫЧЫ́ЦА, другая назва р. *Лаўрыха.*

СМЫШЛЯЕЎ Валянцін Сяргеевіч (27.3.1891, г. Н. Ноўгарад, Расія — 3.10.1936), рускі акцёр, рэжысёр, педагог, тэатр. дзеяч. Засл. арт. Расіі (1935). Вучыўся ў Маскоўскім ун-це (1912—17). З 1915 акцёр і рэжысёр у 1-й Студыі Маскоўскага Маст. т-ра, у 1924—31 у Маскоўскім Маст. акад. т-ры другім. Паставіў спектаклі «Утаймаванне свавольніцы» (1923), «Гамлет» (1924) У.Шэкспіра, «Арэстэя» Эсхіла (1926) і інш. У 1925—31 узначальваў тэатр. студыі, з 1933 Маскоўскі драм. т-р. У 1922—26 маст. кіраўнік *Беларускай драматычнай студыі* ў Маскве, дзе паставіў спектаклі «Цар Максімілян» (нар. драма ў апрацоўцы А.Рэмізава і М.Міцкевіча, 1924), «Сон ў летнюю ноч» Шэкспіра (1925), «Вакханкі» Эўрыпіда (1926, з К.Саннікавым) і інш. Яго рэжысуры ўласцівы пошукі новых сродкаў сцэнічнай выразнасці, выкарыстанне прыёмаў гратэску і буфанады. Аўтар кн. «Тэхніка апрацоўкі сцэнічнага відовішча» (ч. 1—2, 2-е выд. 1922).

СМЯЛКО́ЎСКІ Леанід Аляксандравіч (17.3.1933, в. Радунь Лепельскага р-на Віцебскай вобл. — 24.8.1995), бел. дамрыст, дырыжор, кампазітар. Засл. арт. Беларусі (1975). Скончыў Бел. кансерваторыю (1959). У 1956—60 выкладаў у Мінскім муз. вучылішчы імя М.Глінкі. З 1958 артыст, з 1960 маст. кіраўнік секстэта домраў, з 1971 маст. кіраўнік, у 1983—93 артыст Камерна-інстр. ансамбля Бел. тэлебачання і радыё. Выканальніцтву С. ўласцівы вытанчаная каларыстычная аркестроўка, меладызм, інтанацыйная выразнасць. Яго муз. творы вылучаюцца вобразнай разнастайнасцю, спалучэннем віртуознасці, гарманічнасці і лірызму. Аўтар араторыі для сімф. арк. і хору на вершы кубінскіх паэтаў «На Кубу прыходзіць дзень» (1962), квінтэта для 2 скрыпак, альта, віяланчэлі і фп. (1965), вак. цыкла «Званы» для голасу з арк. на вершы Ф.Гарсія Лоркі (1971), 5 паэм для хору «Магеланавы воблакі» (1978), уверцюры на бел. тэмы (1979), рамансаў і песень на словы бел. паэтаў, апрацовак нар. песень («Ох і сеяла Ульянаўна лянок», «Дубочак зялёненькі», «Каля майго церама»), аранжыровак твораў бел. кампазітараў. *А.В.Скорабагатчанка.*

СМЯРДЗЮ́ЧКІ, падсямейства млекакормячых, гл. *Скунсы.*

СМЯРО́ТНАСЦЬ, змяншэнне насельніцтва ў выніку *смерці*. Залежыць ад матэрыяльнага і культ. ўзроўню насельніцтва, ладу жыцця, харчавання і інш. С. сярод мужчын усіх узростаў больш высокая, чым сярод жанчын. Ацэньваецца па агульным паказніку (колькасць памерлых за 1 год на 1 тыс. сяраднегадавой колькасці насельніцтва) і спец. каэфіцыентах (С. дзіцячая, мацярынская, у залежнасці ад сямейнага становішча і інш.). Паводле крытэрыяў Сусв. арг-цыі аховы здароўя узровень агульнай С. да 9‰ (9 выпадкаў на 1 тыс. нас.) — нізкі, 9—15‰ — сярэдні, больш за 15‰ — высокі. Найб. частыя прычыны агульнай С. — хваробы кровазвароту (каля 50‰), злаякасныя новаўтварэнні (15—18‰), старасць, няшчасныя выпадкі, атручэнні, хваробы органаў дыхання і інш. На Беларусі агульная С. складала 25,5‰ у 1913, 6,6‰ у 1960-я г., 13,5‰ у 1998, 11,3‰ у 1998. *І.М.Семяненя.*

СМЯРО́ТНАЯ КА́РА, у заканадаўствах многіх краін свету вышэйшая мера крымінальнага пакарання. У крымінальным заканадаўстве Рэспублікі Беларусь — выключная мера пакарання (расстрэл). Прадугледжана за некаторыя асабліва цяжкія злачынствы, спалучаныя з наўмысным пазбаўленнем жыцця чалавека пры абцяжваючых акалічнасцях (арт. 59 КК). С.к. не можа быць прызначана: асобам, якія ўчынілі злачынства ва ўзросце да 18 гадоў; жанчынам; мужчынам, якія дасягнулі да дня пастанаўлення прыгавору 65 гадоў. С.к. ў парадку памілавання можа быць заменена *пажыццёвым зняволеннем*. Альтэрнатывай С.к. па справах той жа катэгорыі з'яўляецца пажыццёвае зняволенне.

СМЯТА́ННІКАЎ Леанід Анатолевіч (н. 12.8.1943, с. Фершаміенуз Чэлябінскай вобл., Расія), расійскі спявак (барытон). Нар. арт. Расіі (1979). Нар. арт. СССР (1987). Скончыў Саратаўскую кансерваторыю (1971), з 1977 выкладаў у ёй. З 1968 саліст Саратаўскага т-ра оперы і балета. Для С. характэрны музыкальнасць, прастата выканання. Сярод партый: Яўген Анегін, Мазепа, Ялецкі («Яўген Анегін», «Мазепа», «Пікавая дама» П.Чайкоўскага), Дэман («Дэман» А.Рубінштэйна), Фігара («Севільскі цырульнік» Дж.Расіні), Жэрмон («Травіята» Дж.Вердзі), Дон Жуан («Дон Жуан» В.А.Моцарта), Петручыо («Утаймаванне свавольніцы» В.Шабаліна). У камерным рэпертуары творы рус. і замежных кампазітараў, нар. песні. Дзярж. прэмія Расіі 1982.

СМЯЯ́Н Мікалай Іванавіч (н. 3.1.1932, в. Бабічы Рэчыцкага р-на Гомельскай вобл.), бел. вучоны ў галіне глебазнаўства. Чл.-кар. Нац. АН Беларусі (1989), акад. Аграрнай АН Беларусі (1992), д-р с.-г. н. (1981), праф. (1990). Засл. дз. нав. Беларусі (2000). Скончыў БДУ (1958). З 1958 у Бел. НДІ глебазнаўства і агрохіміі (з 1969 нам. дырэктара). Навук. працы па генезісе, класіфікацыі, агравытв. групоўцы і баніціроўцы глеб Беларусі. Дзярж. прэмія Беларусі 1976.

Тв.: Почвы Белорусской ССР. Мн., 1974 (у сааўт.); Пригодность почв БССР под основные сельскохозяйственные культуры. Мн., 1980; Почвы и структура посевных площадей. Мн., 1990; Полевое исследование и картографирование почв БССР. Мн., 1990 (у сааўт.).



М.І.**Смяян**.

СНАБІ́ЗМ (англ. snobbism), погляды, манеры, паводзіны, уласцівыя снобам — прадстаўнікам арыстакратычнага кола, якія слепа прытрымліваюцца густаў, манер і моды вышэйшага свету, прэтэндуюць на вытанчанасць густу, на выключнае кола заняткаў, інтарэсаў і зняважліва ставяцца да ўсяго, што выходзіць па-за межы іх правіл і паводзін. Абвінавачанне каго-н. у С., як правіла, мае неадабральнае адценне.

СНА́ЙПЕР (англ. sniper ад snipe страляць з укрыцця), стралок, які валодае майстэрствам трапнай стральбы, маскіроўкі і назірання. Дзейнічае са спец. падрыхтаванай пазіцыі, выкарыстоўвае аптычныя прыцэлы (гл. *Снайперская вінтоўка*).

Упершыню С. з'явіліся ў англ. арміі ў 1-ю сусв. вайну 1914—18, масава выкарыстоўваліся ў 2-ю сусв. вайну 1939—45. Ва Узбр. Сілах СССР у 1941—45 ствараліся спец. курсы, зборы, снайперскія школы, у т.л. Цэнтр. жаночая школа снайперскай падрыхтоўкі, і інш. Для заахвочвання лепшых С. у маі 1942 устаноўлены нагрудны знак «Снайпер». Многія С. сталі Героямі Сав. Саюза, у т.л. беларус Ф.А.*Смалячкоў*.

У наш час падрыхтоўку С. ажыццяўляюць ва ўзбр. сілах і спец. службах многіх дзяржаў, у т.л. ў Беларусі. С. выконваюць задачы па знішчэнні важных адзіночных цэляў, нізкалётных самалётаў, верталётаў і інш. (у выключных выпадках выкарыстоўваюцца для знішчэння тэрарыстаў, рэцыдывістаў і інш. злачынцаў, якія пагражаюць жыццю грамадзян, у т.л. заложнікаў). Часам С. наз. трапных стралкоў у артылерыі, танк. войсках, авіяцыі і інш.

СНА́ЙПЕРСКАЯ ВІНТО́ЎКА, тып *вінтоўкі* з аптычным прыцэлам для ўзбраення *снайпераў*. Выкарыстоўваецца для вядзення трапнай стральбы па адзіночных цэлях. Аптычны прыцэл паляпшае дакладнасць прыцэльвання, спрыяе назіранню ва ўмовах дрэннай бачнасці. Для стральбы ноччу выкарыстоўваюць прыцэлы начнога бачання або асвятленне сеткі аптычнага прыцэла.

Адрозніваюць С.в. неаўтаматычныя (магазінныя) і аўтаматычныя (самазарадныя). Найб. пашырана самазарадная С.в., напр., 7,62-міліметровая з аптычным прыцэлам 4-кратнага павеліч эння канструкцыі Драгунова (Расія), прыцэльная далёкасць стральбы — да 1300 м, са звычайным адкрытым прыцэлам — 1200 м; найб. дзейсны агонь — да 800 м.

Для С.в. выкарыстоўваюцца штатныя вінтовачныя патроны, а таксама снайперскія патроны, якія маюць больш стабільныя балістычныя характарыстыкі і забяспечваюць лепшую трапнасць стральбы. У камплект многіх С.в. уваходзіць штык-нож. Найб. выкарыстоўваюцца самазарадныя С.в.: 7,5-міліметровая FR—FI (Францыя), 7,62-міліметровая XM21 (ЗША), 7,62-міліметровая SSG-69 (Аўстрыя) і інш.

СНАПКО́ Валерый Мікалаевіч (н. 19.2.1939, г. Тапкі Кемераўскай вобл., Расія), бел. фізік. Д-р фіз.-матэм. н. (1986), праф. (1993). Скончыў БДУ (1961). З 1961 у Ін-це фізікі Нац. АН Беларусі (у 1983—93 і з 1998 заг. лабараторыі). У 1993—98 у Вышэйшым атэстацыйным камітэце Беларусі. Навук. працы па спектральнай дыягностыцы нізкатэмпературнай плазмы, уздзеянні магутнага лазернага выпрамянення на рэчыва, аптычнай піраметрыі. Вызначыў т-ру і канцэнтрацыю электронаў плазмы, што ўтвараецца пры ўваходзе касм. апарата ў атмасферу Зямлі. Дзярж. прэмія Беларусі 1974.

Тв.: Спектральные методы оптической пирометрии нагретой поверхности. Мн., 1988; Поляризационные характеристики оптического излучения и методы их измерения. Мн., 1992.

СНАПКО́ЎСКАЯ Святлана Валянцінаўна (н. 20.11.1954, Мінск), бел. гісторык і педагог. Д-р гіст. н. (1999), праф. (2000). Скончыла БДУ (1979) і з 1980 працавала ў ім. У 1992—2001 заг. лабараторыі гісторыі адукацыі і этнапедагогікі Нац. ін-та адукацыі, адначасова ў 1997—2000 заг. кафедры педагогікі і псіхалогіі Бел. дзярж. ін-та ўдасканалення ўрачоў, з 2000 у Бел. пед. ун-це імя М.Танка. Даследуе гісторыю палітыкі царызму ў галіне адукацыі на Беларусі, педагогікі і асветы Беларусі ў 2-й пал. 19 ст. — 1917. Адзін з рэдактараў калект. прац «Асвета і педагагічная думка на Беларусі: Бібліягр. паказ» (ч. 1—3, 1995—2001), «Народная педагогіка беларусаў» (1996).

Тв.: Ля вытокаў нацыянальнай педагогікі: З гісторыі школы і пед. думкі Беларусі канца XIX — пачатку XX ст. Мн., 1995; Шляхі развіцця школы на Беларусі ў канцы XIX — па-



Снайперская вінтоўка Драгунова.

чатку XX ст. Мн., 1997; Адукацыйная палітыка і школа на Беларусі ў канцы XIX — пачатку XX стст. Мн., 1998; Гісторыя адукацыі і педагагічнай думкі Беларусі (60-я гг. XIX — пачатак XX ст.). Мн., 2001.

СНАПКО́ЎСКІ Уладзімір Еўдакімавіч (н. 22.5.1954, г. Віцебск), бел. гісторык. Д-р гіст. н. (1993), праф. (1995). Скончыў БДУ (1976). У 1979—82 і ў 1988—2000 у Ін-це гісторыі Нац. АН Беларусі (з 1995 заг. аддзела нац. і міжнар. адносін). У 1982—88 вучоны сакратар Аддзялення грамадскіх навук АН Беларусі, з 1993 праф. кафедры міжнар. адносін ф-та міжнар. адносін БДУ. Даследуе знешнюю палітыку Беларусі 20 ст., гісторыю бел. эміграцыі, пытанні гістарыяграфіі ўсеагульнай гісторыі і гісторыі Беларусі, дзейнасці міжнар. арг-цый, палітalогіі і сацыялогіі (эліта і міжнар. камунікацыя).

Тв.: Белорусская ССР в ООН (1945—1985 гг.). Мн., 1985; Два германских государства и европейская безопасность: история и современность. Мн., 1989 (разам з М.Г.Елісеевым); Путь Беларуси в ООН, 1944—1945 гг. Мн., 1994; Знешнепалітычная дзейнасць Беларусі, 1944—1953 гг. Мн., 1997; Белорусская эмиграция // Белоруссия и Россия: Общества и государства. М., 1998; Сценарии белорусско-российской интеграции // Белорусско-российские отношения: пробл. и перспективы. Мн., 2000.

«СНАПО́К», заходнебеларускі ілюстраваны дзіцячы часопіс. Выдаваўся з мая 1937 да вер. 1939 у Варшаве на бел. мове. Рэдактар-выдавец С.К.Паўловіч. Меў на мэце пашыраць асвету на роднай мове, садзейнічаць фарміраванню дэмакр. поглядаў, абуджаць нац. свядомасць, далучаць да скарбніцы нац. і сусв. культуры. Змясціў артыкулы Паўловіча пра асветнікаў Кірылу і Мяфодзія, Ефрасінню Полацкую, арх. помнікі Беларусі; Р.Шырмы пра каляндарна-земляробчыя святы, звычаі, нар. песні; нарысы М.Караленкі пра прыроду, пазнавальныя матэрыялы пра бел. рэкі, паветраплаванне і інш. Друкаваў творы М.Танка, М.Васілька, М.Машары, Н.Тарас, А.Дубровіча, байкі Я.Быліны, казкі, песні, прыказкі, загадкі. Перадрукоўваў вершы і ўрыўкі з паэм Я.Купалы, Я.Коласа, М.Багдановіча, К.Буйло, Я.Журбы і інш. Змяшчаў у перакладзе творы М.Лермантава, Ф.Цютчава, І.Нікіціна, Г.Сянкевіча і інш. *А.С.Ліс.*

СНАРА́Д артылерыйскі, асноўны элемент артылерыйскага выстралу — *боепрыпасу* для стральбы з *гармат*. Паводле канструкцыі і прынцыпу дзеяння бываюць звычайныя (актыўныя, набываюць рух за кошт энергіі парахавых газаў у канале ствала) і актыўна-рэактыўныя (выштурхоўваюцца са ствала як актыўныя, дадатковую скорасць набываюць ад рэактыўнага рухавіка).

С. падзяляюцца на малога (да 75 мм), сярэдняга (75—155 мм у наземнай, да 152 у марской і да 100 мм у зенітнай артылерыі) і буйнога калібру (звыш названых велічынь); каліберныя (дыяметр паражальнай часткі С. роўны калібру гарматы), падкаліберныя (дыяметр актыўнай часткі меншы за калібр гарматы) і надкаліберныя (большы за калібр гарматы, устаўляецца ў ствол хваставой часткай); асноўныя — асколачныя, фугасныя, асколачна-фугасныя, з гатовымі паражальнымі элементамі, броне- і бетонабойныя, кумулятыўныя, запальныя, касетныя, кіроўныя (для паражэння рухомых і малапамерных цэлей, у т.л. з лазернымі галоўкамі саманавядзення); спецыяльныя — асвятляльныя, дымавыя, прыстрэлачна-ўказальныя, прошрадыяцыйныя і інш.; дапаможныя — навучальныя, практычныя, сістэмапробныя; вярчальныя і невярчальныя (апераныя). Ёсць таксама хім. і ядз. С., якія адносяцца да *зброі масавага знішчэння*. Ядз. С. выкарыстоўваюць для стральбы з дальнабойных буйнакаліберных гармат. *І.С.Жалудок.*

СНАТВО́РНЫЯ СРО́ДКІ, лекавыя сродкі, якія нармалізуюць *сон* (засыпанне, працягласць і глыбіню). Да іх адносяцца вытворныя *барбітуравай кіслаты* (барбітураты) — фенабарбітал, барбаміл, барбітал, этамінал-натрый; вытворныя бензадыязэпіну — нітразепам, феназепам, сібазон, трыязалам; вытворныя піперыдзіну (напр., глютэтымід); злучэнні аліфатычнага рада (хлоралгідрат, бромізавал); вытворныя хіназалінону (напр., метаквалон); амінакіслата трыптафан і інш. У якасці С.с. выкарыстоўваюць лек. сродкі, якія знімаюць сімптомы, што парушаюць сон (напр., абязбольвальныя, спазмалітычныя, антыдэпрэсанты). С.с. актывізуюць тармазныя працэсы ў мозгу. Барбітураты парушаюць суадносіны фаз хуткага і павольнахвалевага сну, пры працяглым ужыванні выклікаюць псіхічную і фіз. залежнасць. Бензадыязэпіны менш парушаюць структуру сну. *І.М.Семяненя.*

СНЕГ, цвёрдыя *ападкі атмасферныя* ў выглядзе сняжынак — снежных (ледзяных) крышталёў, разнастайных па форме, але з гексаганальнай асновай (шасцівугольная пласцінка, зорачка і інш.). Пры штылі і т-ры каля 0 °С сняжынкі зліпаюцца і ўтвараюць камякі дыяметрам да некалькіх сантыметраў. Ва ўмераных і высокіх шыротах С. — тыповы зімовы від ападкаў, які ўтварае снегавое покрыва. На Беларусі С. можа выпадаць з канца вер. да мая. У пераходныя месяцы можа спалучацца з дажджом (гл. *Мяшаныя ападкі*). Сярэдняя колькасць сутак са снегападам (0,1 мм/сут ці больш) складае ад 55 на ПдЗ да 82 на ПнУ і У. Сярэдняя працягласць выпадзення С. 8—9 гадз за суткі на Пд і 10—11 гадз на Пн. На працягу сутак у выглядзе С. звычайна выпадае 2—3 мм ападкаў (у пераліку на слой вады), або 2—3 кг на 1 м^2. Макс. зарэгістраваная ў 2-й пал. 20 ст. сутачная колькасць сухога С. склала 36,8 мм (18.1.1970, ст. Пружаны). Значны снегапад і асабліва *мяцеліца* пагаршаюць бачнасць. Вял. снегапады абломліваюць галіны дрэў у лясах і садах, парушаюць рух транспарту. Гл. таксама *Снегавое покрыва*, *Снегазатрыманне*.

СНЕГАВА́Я ЛІ́НІЯ, снегавая мяжа, вышынны ўзровень, вышэй за які намнажэнне цвёрдых ападкаў пераважае над іх раставаннем і выпарэннем. Вышыня яе вызначаецца тэмпературнымі ўмовамі і колькасцю цвёрдых ападкаў, звязаных з шыратой мясцовасці і кантынентальнасцю клімату, асаблівасцямі араграфіі, у т.л. экспазіцыі схілаў. У экватарыяльных шыротах С.л. на выш. каля 4600 м, у трапічных — 5000—6000 м, у Альпах — 2200—3100 м, на Каўказе — 3500—3700 м. У Арктыцы С.л. апускаецца да 500—200 м, а ў Антарктыдзе зніжаецца да ўзроўню мора.

СНЕГАВО́Е ПО́КРЫВА, слой *снегу* на паверхні Зямлі, які ўтвараецца ад снегападаў. Бывае часовае (растае за некалькі гадзін або дзён) і ўстойлівае (ляжыць на працягу ўсёй зімы або з невял. перапынкамі). Характарызуецца вышынёй і шчыльнасцю (вымяраецца *снегамерам*). Моцна адбівае сонечную радыяцыю (гл. *Альбеда*), істотна ўплывае на водна-цеплавы рэжым глебы, садзейнічае затрыманню цяпла, ахоўвае расліны ад вымярзання. Аказвае ўздзеянне на клімат, рэльеф, гідралагічныя і глебаўтваральныя працэсы, жыццё расл. і жывёльнага свету. Макс. плошчы на Зямлі С.п. займае ў канцы зімы Паўн. паўшар'я (99 млн. км^2), мінім. — у канцы зімы Паўд. паўшар'я (47 млн. км^2). Каля 30% снегу, які ўтвараецца штогод, служыць крыніцай жыўлення ледавікоў. На Беларусі ўстойлівае С.п. трымаецца ў сярэднім 100—110 сут на ПнУ і 70—80



Снарады: а — віды паводле калібру (1 — каліберны, 2 — надкаліберны, 3 — падкаліберны); б — вярчальны асколачны (1 — корпус, 2 — разрыўны зарад, 3 — узрывальнік); в — бранябойны падкаліберны (1 — трасер, 2 — карбідавальфрамавы асяродак, 3 — балістычны наканечнік); г — кумулятыўны вярчальны (1 — трасер, 2 — капсуль-этанатар, 3 — выбуховае рэчыва, 4 — кумулятыўная варонка, 5 — засцерагальнік, 6 — узрывальнік); д — асвятляльны (1 — парашут, 2 — асвятляльная зорка, 3 — выбіўны зарад, 4 — узрывальнік).



сут па ПдЗ, утвараецца звычайна на ПнУ у пач., а на ПдЗ у канцы снежня, разбураецца ў сак., канчаткова сыходзіць праз 9—20 сут. Найб. выш. С.п. ў канцы лютага — пач. сак. — ад 15—20 см на Пд да 20—45 см на Пн. Шчыльнасць С.п. ў першыя месяцы зімы на адкрытых участках 0,1—0,15 г/см^3, у канцы яе да 0,3—0,4 г/см^3 (у лесе меншая). Гл. таксама *Снегавая лінія*, *Снегазатрыманне*.

СНЕГАЗАТРЫМА́ННЕ, снегазатрыманне, агратэхнічны прыём, накіраваны на назапашванне снегу. Праводзіцца на палях з азімымі культурамі і на зябліве пад пасеў яравых культур. Садзейнічае памяншэнню глыбіні прамярзання глебы, ахоўвае азімыя культуры ад вымярзання, стварае дадатковыя запасы вільгаці на палях, паляпшае ўмовы інфільтрацыі расталай вады вясной. С. ажыццяўляюць з дапамогай *куліс*, полеахоўных лясных палос, штучных перашкод з галля ці шчытоў, снегавых валоў, размешчаных упоперак пануючых вятроў, пакінутага ў полі высокага ржышча і інш. На Беларусі праводзіцца пераважна на ПдУ, дзе ў маі і чэрв. назіраецца недахоп вільгаці, а таксама на пясчаных і рыхласупясчаных глебах, на неаблесеных вяршынях марэнных град, водападзелах і інш., асабліва ў маласнежныя зімы.

СНЕГАМЕ́Р, прылада для вымярэння шчыльнасці *снегавога покрыва*. Асн. частка С. — цыліндр (выш. 50—60 см, пл. сячэння 100 см^2) са шкалой па вышыні ў сантыметрах. Пры вымярэнні цыліндр паглыбляюць вертыкальна ў снег да подсцільнай паверхні, вышыню снегавога покрыва адзначаюць па шкале, яго шчыльнасць — па адносінах масы ўзятай пробы да яе аб'ёму. Выкарыстоўваюць таксама гама-С., прынцып дзеяння якога заснаваны на паглынанні снегам гама-выпрамянення ад крыніцы, размешчанай пад снегавым покрывам.

СНЕГАЎБО́РАЧНЫЯ МАШЫ́НЫ, машыны для выдалення снегу з палатна аўтамаб. дарог, чыг. і трамвайных пуцей, аэрадромаў, вуліц, плошчаў і тратуараў. Падзяляюцца на снегаачышчальнікі, снегапагрузчыкі і пуцявыя С.м.

СНЕГАЎБОРАЧНЫЯ

Снегаачышчальнікі дарожныя бываюць мех. (плужныя, плужна-шчотачныя, ротарныя, шнэкаротарныя) і цеплавыя (газаструменныя); на пнеўмаколавым (аўтамабілі, трактары, колавыя цягачы, прычэпы і паўпрычэпы) і гусенічным ходу. Плужныя (адна- і двухадвальныя) выкарыстоўваюць для патрульнай снегаачысткі; плужна-шчотачныя — для поўнага выдалення снегу з пакрыцця ссоўваннем асн. снегавой масы ў бок адвалам і змятання астатняга ўшчыльненага снегу шчоткай; ротарныя — для кідання снегу на 5—20 м (рэжучым дыскам або фрэзай-ротарам) за межы земляного палатна; плужна-ротарныя — для патрульнай ачысткі кідальным ротарам (да 15 м), снег да якога падаецца плугам; шнэкаротарныя — для выдалення значных снегавых мас на 30—35 м; газаструменныя — для ачысткі ад снегу дарог і аэрадромаў пры таўшчыні снегавога покрыва да 0,2 м газаструменным, газаструменна-мех., газаструменна-шчотачным уздзеяннем на снег. Чыгуначныя снегаачышчальнікі бываюць плугавыя, фрэзерныя, ротарныя. Рабочы орган устаноўлены ў пярэдняй частцы (у плугавых з двух тарцоў) вагона, які падштурхваецца лакаматывам. Снегапагрузчыкі прызначаны для пагрузкі снегу з валоў або куч у трансп. сродкі, некаторыя з іх могуць грузіць пясок, хларыды і інш. сыпкія матэрыялы. Зманціраваны на спец. аўтамаб. або трактарныя шасі, рабочы орган мае сілкавальнік лапавага тыпу (ці фрэзерны) і скіпавы коўш або скрабалкавы канвеер (элеватар). Пуцявыя ўборачныя машыны ачышчаюць тэр. чыг. станцый ад снегу і смецця. Рабочы орган іх — ротар з гнуткімі лопасцямі, крылы, ледасколвальнае прыстасаванне, канвееры. Снег загружаецца ў прычапныя паўвагоны, падлогай у якіх служыць пласціністы канвеер. Таўшчыня слоя ачысткі да 0,8 м. Для ачысткі стрэлачных пераводаў, сартавальных горак, тэрыторый станцый выкарыстоўваюць пуцявыя струг, шматвагонныя (прычапныя да лакаматыва ці самаходныя) снегаўборачныя паязды і інш.

На Беларусі некаторыя разнавіднасці С.м. выпускаюць акц. т-ва «Амкадор» і прадпрыемства «Белдартэхніка».

С.В.Багдановіч.



Снегаўборачныя машыны: 1 — шнэка-ротарны снегаачышчальнік ДЭ-226 (акцыянернага таварыства «Амкадор»); 2 — франтальна-бакавы снегаўборачны адвал і раскідвальнік на аўтамабілі МАЗ; 3 — снегапагрузчык саўковага тыпу са скрабалкавым транспарцёрам; 4 — снегаўборачная машына для ачысткі тэрыторый чыгуначных станцый і стрэлачных пераводаў; 5 — чыгуначны ротарны снегаачышчальнік.

СНЕГІРО́Ў Іван Міхайлавіч (4.5.1793, Масква — 21.12.1868), рускі этнограф, фальклярыст, археолаг. Скончыў Маскоўскі ун-т (1814), з 1826 праф. у ім. Сабраў, пракаменціраваў і апублікаваў багаты матэрыял па рус. лубачных малюнках, прыказках і прымаўках. Апісаў рус. нар. святы і абрады, з выкарыстаннем для параўнання слав. і зах.-еўрап. крыніц, найб. поўна — бел. этнагр. друкаваныя і рукап. матэрыялы, якія дасылалі яму В.Р.Анастасевіч, В.М.Бадзянскі і інш. Асабліва многа каштоўных звестак, сабраных па анкеце З.Я.Даленгі-Хадакоўскага студэнтамі Віленскага ун-та, перадаў яму І.М.Лабойка. Сябраваў з Даленгам-Хадакоўскім, кансультаваўся з ім па пытаннях гісторыі, этнаграфіі і фальклору бел. народа, карыстаўся яго архівам. Багаты матэрыял па этнаграфіі, гісторыі і фальклоры Беларусі змясціў у працы «Руския простанародныя святы і прымхлівыя абрады» (вып. 1—4, 1837—39).

Літ.: Ивановский А. И.М.Снегирев и дневник его воспоминаний, 1821—1865. СПб., 1871; Пыпин А.Н. История русской этнографии. Т. 1. СПб., 1890. *Л.А.Малаш.*

СНЕ́ГУР (Snegur) Мірча (н. 17.1.1940, с. Трыфанешты Фларэшцкага р-на, Малдова), дзяржаўны і паліт. дзеяч Малдовы. Канд. с.-г. н. Скончыў Кішынёўскі с.-г. ін-т. З 1961 працаваў гал. аграномам, старшынёй калгаса, дырэктарам доследнай станцыі Кішынёўскага с.-г. ін-та; з 1971 у сістэме Мін-ва сельскай гаспадаркі Малд. ССР, з 1978 дырэктар Малд. НДІ паляводства, ген. дырэктар навук.-вытв. аб'яднання «Селекцыя». У 1981—85 сакратар Едзінецкага райкома, у 1985—89 сакратар ЦК Кампартыі Малдавіі. У 1989—90 старшыня Прэзідыума Вярх. Савета Малд. ССР. У 1990—96 Прэзідэнт Рэспублікі Малдова, якая пры ім 27.8.1991 абвясціла пра сваю незалежнасць.

СНЕ́ЖАНЬ (назва ад слова «снег»), дванаццаты месяц каляндарнага года (31 дзень), першы месяц *зімы*. У С. Сонца праходзіць праз пункт зімовага *сонцастаяння* (21 або 22 снеж.). 15 С. даўж. дня ў Мінску 7 гадз 24 мін, выш. Сонца над гарызонтам у поўдзень 12,7°. Сярэдняя сума сонечнай радыяцыі за месяц 41 МДж/м^2, радыяцыйны баланс адмоўны (-17 МДж/м^2). Сярэдняя т-ра паветра ад -2 °С на ПдЗ да -5,5 °С на ПнУ Беларусі. Адносная вільготнасць паветра дасягае максімуму (88—91%), пахмурных дзён 20—23, ападкаў 35 мм за месяц. У 2-й дэкадзе звычайна ўстанаўліваецца ўстойлівае снегавое покрыва, укрываюцца лёдам рэкі і азёры. У С. 12—21 дзень з адлігай. У канцы месяца глеба прамярзае на 20—30 см. С. — цяжкі перыяд для жывёльнага свету. У пошуках корму прылятаюць да чалавечага жылля чачоткі, шчыглы, чыжы, аўсянкі, галкі, сарокі, вароны. Ліс палюе на мышэй-палёвак і зайцоў, ваўкі нападаюць нават на свойскую жывёлу. Заканчваецца гон у дзікоў, у ментуза ў канцы С. пачынаецца нераст. У садах вядуць барацьбу з мышападобнымі грызунамі.

СНЕ́ЖАНЬСКАЯ ЎСЕРАСІ́ЙСКАЯ ПАЛІТЫ́ЧНАЯ СТА́ЧКА 1905, разам з *Кастрычніцкай усерасійскай палітычнай стачкай 1905*, вышэйшы этап *рэвалюцыі 1905—07 у Расіі*. Адбывалася пад кіраўніцтвам рэв. партый — *бальшавікоў*, *меншавікоў*, *сацыялістаў-рэвалюцыянераў* і *Бунда*, адначасова і ў цеснай сувязі са снежаньскімі ўзбр. паўстаннямі 1905. Стачцы папярэднічаў рэв. ўздым пасля абвяшчэння *Маніфеста 17 кастрычніка 1905*. У кастр.—снеж. 1905 у Расіі баставалі 1277 тыс. рабочых. Стачка ініцыравана бальшавікамі як папярэдняя фаза запланаванага імі ўсеагульнага ўзбр. паўстання з мэтай звяржэння царызму і ўсталявання рэв.-дэмакр. дыктатуры рабочых і сялян. Кіраўніцтва стачкай і паўстаннем ускладалася на Саветы рабочых дэпутатаў (гл. *Саветы дэпутатаў*) і падобныя да іх арг-цыі. 19.12.1905 Маскоўскі Савет, дзе пераважалі бальшавікі, вырашыў пачаць 20 снеж. ўсеагульную стачку, каб перавесці яе ва ўзбр. паўстанне. Гэтае рашэнне падтрымалі канферэнцыя чыгуначнікаў і з'езд паштова-тэлегр. служачых. У розныя рэгіёны краіны выехалі дэпутаты Маскоўскага Савета, каб наладзіць кантакты і заручыцца падтрымкай. Усё гэта паспрыяла адначасоваму пачатку стачкі і яе хуткаму пашырэнню па ўсёй Расіі, у т.л. на Беларусі. Баставалі чыгункі, пошта, тэлеграф, рабочыя буйных прамысл. цэнтраў. Гал. патрабаваннем бастуючых была ліквідацыя самадзяржаўя. 22 снеж. стачка ў Маскве перарасла ва ўзбр. выступленне. Урадавым войскам у ходзе барыкадных баёў супрацьстаялі бальшавіцкія, эсэраўскія і меншавіцкія баявыя дружыны (6 тыс. чал., з іх 2 тыс. ўзброеныя). З прыбыццём у Маскву Сямёнаўскага і Ладажскага палкоў 31 снеж. паўстанне было падаўлена. Узбр. паўстанні адбыліся яшчэ ў 30 гарадах Расіі (Растоў-на-Доне, Ніжні Ноўгарад, Екацярынаслаў, Харкаў і інш.). У Чыце, Краснаярску, Новарасійску (гл. «*Новарасійская рэспубліка*») улада на непрацяглы тэрмін пераходзіла ў рукі Саветаў. Але ўсе гэтыя выступленні насілі ізаляваны характар і да лют. 1906 задушаны карнымі войскамі.

На Беларусі 21—22 снеж. забаставалі ўсе чыгуначнікі, іх падтрымалі рабочыя 17 гарадоў, у 13 з якіх стачка набыла агульнагар. характар. Стачкамі кіравалі стачачныя к-ты (Баранавічы, Орша, Пінск, Лунінец, Магілёў), кааліцыйныя саветы (Мінск, Віцебск), *Гомельскі камітэт дзелегатаў*. Гэтыя органы выконвалі некат. функцыі рэв. улады. Адбываліся масавыя мітынгі і дэманстрацыі, фарміраваліся баявыя дружыны. Бел. рабочыя спрабавалі перашкодзіць прасоўванню карных войск у Маскву і інш. цэнтры паўстання. У Гомелі, Баранавічах (гл. *Баранавіцкае выступленне рабочых і салдатаў 1905*), Пінску, Смаргоні сітуацыя была блізкая да ўзбр. паўстання, але мясц. рэв. арг-цыі чакалі зыходу барацьбы ў цэнтры Расіі. У канцы снеж. 1905 — пач. студз. 1906 забастоўкі на Беларусі задушаны царскімі войскамі.

Літ.: Яковлев Н.Н. Вооруженные восстания в декабре 1905 г. М., 1957; Нарысы гісторыі Беларусі. Ч. 1. Мн., 1994.

СНЕ́ЖКА (чэш. Sněžka, польск. Śnieżka), самая высокая вяршыня (1602 м) у Судэтах (у гарах Крконашы) на мяжы Польшчы і Чэхіі. Складзена са сланцаў. На схілах лясы, горныя лугі, камяністыя россыпы. Б.ч. года ўкрыта снегам. Метэастанцыя. Канатная дарога. Нац. паркі Польшчы і Чэхіі. Турызм, зімовы спорт.

СНЕ́ЖНАЯ, вёска ў Галынкаўскім с/с Зэльвенскага р-на Гродзенскай вобл. Цэнтр калгаса. За 12 км на ПнУ ад гар. пас. і 14 км ад чыг. ст. Зэльва, 140 км ад Гродна. 318 ж., 118 двароў (2001). Пач. школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў, помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

СНЕ́ЖНАЯ БЕ́ЗДАНЬ, карставая пячора ў Абхазіі (Грузія), у паўд. адгор'ях Бзыбскага хр. Вял. Каўказа, каля г. Гудаута. Глыб. 1370 м, даўж. галерэй і залаў больш за 9 км. Складзена з вапня-



Снежная плесня: 1 — пашкоджаная расліна; 2 — міцэлій грыба на зерні; 3 — прарастанне заражанага зерня.

коў, даламітаў і кангламератаў. Падземныя рэкі, вадаспады, ледавік. Пашыраны нацечныя ўтварэнні тыпу «каменнага інею», *сталактыты*, *сталагміты*. Спелеафауна, у т.л. лжэскарпіён.

СНЕ́ЖНАЯ ПЛЕ́СНЯ, хвароба збожжавых культур, якая выклікаецца грыбамі роду фузарыум. Пашкоджвае азімыя жыта і пшаніцу, шматгадовыя травы (купкоўку зборную, мятліцу, лісахвост і інш.). Назіраецца пераважна ў гады з працяглым раставаннем снягоў, частымі туманамі і недастатковай інсаляцыяй. На Беларусі найб. шкодзіць у паўн.-ўсх. раёнах Віцебскай і Магілёўскай, паўн.-зах. раёнах Гродзенскай і Мінскай абласцей.

Інфекцыя захоўваецца ў глебе на расл. рэштках у выглядзе пладовых цел, міцэлію, склероцыяў і інш. На лісці раслін пры выхадзе з-пад снегу ўтвараецца суцэльны ружавaты павуціністы налёт. Спачатку ўзнікаюць *каніды* (заражаюць маладыя расліны), потым пладовыя целы з сумкамі і сумкаспорамі (заражаюць каласковыя лускавінкі і зярняўкі). Пашкоджаныя расліны трацяць лісце або гінуць.

СНЕЖНАЯЯГАДНІК, снежнік, снежная ягада (Symphoricarpus), род кветкавых раслін сям. бружмелевых. Каля 15 відаў. Пашыраны ў Паўн. Амерыцы і Кітаі. На Беларусі інтрадукавана 8 відаў. Найб. вядомыя С.: белы, ці снягулькі (S. albus), круглалісты (S. rotundifolius) і прырэчны (S. rivularis). Культывуюцца ў садах, парках, часта дзічэюць.

Лістападныя кусты выш. да 2,5 м. Лісце супраціўнае, простае, суцэльнакрайняе, часам выемчата-зубчастае або лопасцевае. Кветкі белыя ці ружовыя, адзіночныя або ў каласках, гронках. Плод — белая, зрэдку чырв. ці чорная касцянка, неядомы. Дэкар., меданосныя расліны. *А.М.Скуратовіч.*

СНЕ́ЖНІК, нерухомае скопішча снегу і лёду, якое захоўваецца даўжэй, чым навакольнае *снегавое покрыва*, або на працягу ўсяго года; стадыя пераходу ад сезоннага снегавога покрыва да ледавікоў. Узнікаюць у зацененых месцах з-за запаволенага раставання снегу, прынесенага ветрам (навеяныя С.) або лавінамі (лавінныя С.). Садзейнічаюць фарміраванню ў гарах *карaў*.

СНЕ́ЖНЫ БАРА́Н, таўстарог, чубук (Ovis canadensis), млекакормячае роду горных бараноў сям. пустарогіх атр. парнакапытных. Пашыраны ў Паўн.-Усх. Азіі і Паўн. Амерыцы (да Мексікі). Азіяцкі С.б. мае 4 падвіды: ахоцкі, камчацкі, нарыльскі, або путаранскі, і якуцкі; паўночнаамерыканскі — 6—8 падвідаў. Жыве на бязлесных горных схілах і скалах.

Даўж. да 180 см, выш. ў карку да 115 см, маса да 140 кг. Самкі значна меншыя за самцоў. Афарбоўка цела ад жоўта-карычневай да цёмна-бурай, бруха светлае. Рогі ў самцоў (па выгіне) даўж. да 111 см, у самак да 32 см. Кормяцца дрэвава-хмызняковай расліннасцю, травой, лішайнікамі. Палігамы. Нараджаецца 1, зрэдку 2 дзіцяняці. Аб'ект палявання.
Э.Р.Самусенка.



Снежнаягаднік белы.



Снежны баран.

СНЕ́ЖНЫ БАРС, драпежнае млекакормячае, гл. *Ірбіс*.

СНЕ́ЙДЭРС (Snyders, Snijders) Франс (11.11.1579, г. Антверпен, Бельгія — 19.8.1657), фламандскі жывапісец, майстар барочнага нацюрморта. Вучыўся ў П.Брэйгеля Малодшага і Х. ван Балена. Працаваў у Антверпене; з 1609, пасля наведвання Італіі, супрацоўнічаў з П.П.*Рубенсам*, пісаў у яго карцінах кветкі, садавіну, жывёл. Самаст. творчасць пачаў з невял. нацюрмортаў з некалькіх прадметаў, гал. чынам кашоў, ваз з садавінай. Пазней перайшоў да манум. палотнаў вял. фармату з выявамі размешчаных на сталах або прылаўках вял. колькасці бітай дзічыны, садавіны, гародніны, кветак, аб'яднаных у раскошныя дэкар. кампазіцыі ў стрыманай гаме. Фігуры людзей у нацюрмортах С. выконвалі пераважна інш. жывапісцы, у т.л. А. ван *Дэйк*, Я.*Іорданс*. У позні перыяд пісаў паляўнічыя сцэны. Сярод твораў: «Кош з садавінай», «Прадавец дзічыны», «Стары кірмаш у Антверпене», «Паляванне на дзікоў», «Нацюрморт з дзічынай і агароднінай».
Я.Ф.Шунейка.

СНЕЙК (Snake), Змяіная рака, рака на ПнЗ ЗША, левы прыток р. Калумбія. Даўж. каля 1670 км, пл. бас. 282,3 тыс. км^2. Пачынаецца ў Скалістых гарах, у межах Йелаўстонскага нац. парку, цячэ па ўсх. ускраіне Калумбійскага плато, месцамі ў каньёнах. На С. — самы глыбокі каньён Паўн. Амерыкі — Хелс (2410 м). Утварае вадаспады (Шашоні, выш. 65 м, і інш.). Разводдзе ў крас.—чэрвені. Сярэдні расход вады 1390 м^3/с. ГЭС і вадасховішчы. Выкарыстоўваецца для арашэння. Суднаходная для невял. суднаў ад г. Льюістан. На С. — гарады Айдаха-Фолс і Туін-Фолс.

СНЕЛ (Snell) Джордж Дэйвіс (19.12.1903, г. Хейверыл, штат Масачусетс, ЗША — 6.6.1996), амерыканскі вучоны ў галіне імунагенетыкі. Чл. Нац. АН ЗША (1970), чл. Амер. акадэміі мастацтваў і навук (1952). Скончыў Дартмут-каледж (1926). З 1926 у Гарвардскім, з 1933 у Вашынгтонскім ун-тах, з 1935 у Джэксанаўскай лабараторыі. Навук. працы па вывучэнні генет. заканамернасцей сумяшчальнасці тканак. Нобелеўская прэмія 1980 (разам з Б.*Бенасерафам* і Ж.*Дасэ*).



Ф.**Снейдэрс**. Нацюрморт з дзічынай і агароднінай.

СНЕ́САРАЎ Андрэй Яўгенавіч (13.12.1865, с. Старая Калітва Расашанскага р-на Варонежскай вобл., Расія — 4.12.1937), расійскі і сав. военачальнік, вучоны-ўсходазнавец, праф. (1921). Герой Працы (1928). Ген.-лейт. (1917). Скончыў Маскоўскія ун-т (1888), кансерваторыю, ваен. вучылішча (1890) і Акадэмію Генштаба (1899); валодаў 14 мовамі. З 1888 на ваен. службе ў Туркестане, дзе вёў ваенна-геагр. апісанне Сярэдняга Усходу; здзейсніў паездкі па Індыі, Афганістане, Тыбеце, Кашгарыі. З 1904 у Генштабе, адначасова выкладаў у ваен. вучылішчах. З 1910 нач. штаба казацкай дывізіі. У 1-ю сусв. вайну камандаваў палком, брыгадай, дывізіяй, корпусам. У Чырв. Арміі з 1918. З вер. 1918 нач. *Заходняга раёна абароны* (гл. таксама *Заходні ўчастак атрадаў заслоны*). З 15.11.1918 па 31.5.1919 камандуючы *Заходняй арміяй 1918—19* (з 13.3.1919 наз. *Беларуска-літоўскай арміяй*, з 7.6.1919 — 16-й арміяй *Заходняга фронту 1919—24*). У 1919—21 нач. Акадэміі Ген.штаба. У 1921—30 рэктар і праф. Ін-та ўсходазнаўства, адначасова (з 1924) праф. Ваенна-паветр. і з 1926 Ваенна-паліт. акадэмій. У 1930—34 знаходзіўся пад арыштам па лжывым абвінавачанні. Аўтар прац па ваен. геаграфіі.

Літ.: А.Е.Снесарев: Жизнь и науч. деятельность. М., 1973.

СНЕТАГО́РСКІ МАНАСТЫ́Р, помнік архітэктуры 14—19 ст. за 3 км ад г. Пскоў (Расія) каля р. Вялікая на Снетнай гары (адсюль назва). Манастыр упершыню згадваецца ў 1299. Меў зямельныя ўгоддзі, рыбныя промыслы. Манастыр быў добра ўмацаваны. На яго неаднаразова нападалі лівонскія рыцары, польскія і шведскія атрады. З 1804 архірэйскі дом. Пасля 1917 скасаваны. Найб. стараж. пабудова С.м. — муравана сабор Раства Багародзіцы (1310). У яго інтэр'еры захаваліся фрэскі 1313, выкананыя сербскімі мастакамі. Крыты цвінтар быў упрыгожаны кафляй. У комплекс таксама ўваходзяць каменныя трапезная палата (пач. 16 ст.) са стоўпападобнай царквой (1519), 8-гранная шатровая царква «пад званы» (усе 16 ст.). Уваход на тэр. манастыра цераз мураваную браму (17 ст.). У 19 ст. комплекс абнесены мураванай агароджай.

Г.А.Лаўрэцкі.

СНЕ́ЧКУС (Sniečkus) Антанас (7.1.1903, в. Бубляляй Марыямпальскага пав., Літва — 22.1.1974), літоўскі паліт. дзеяч. Герой Сац. Працы (1973). Скончыў Смаленскі ун-т (1925), Міжнар. ленінскую школу ў Маскве (1935). У 1919—21 тэхнік на тэлеграфе ў г. Алітус. З 1920 чл. Камуніст. партыі Літвы (КПЛ). Працаваў у выд-ве ЦК КПЛ у Смаленску (1921—25). Пасля дзярж. перавароту ў Літве (снеж. 1926) на падп. рабоце ў Каўнасе, сакратар ЦК КПЛ (1927—30). У 1930 арыштаваны; пасля абмену палітзняволенымі паміж Літвой і СССР прыбыў у Маскву. У 1933—36 нам. прадстаўніка КПЛ пры Выканкоме Камінтэрна. У 1936—39 і 1940—74 1-ы сакратар ЦК КПЛ. У 1942—44 нач. штаба партыз. руху Літвы. Чл. ЦК КПСС (з 1952; канд. з 1941). Дэп. Вярх. Саветаў Літвы (з 1940) і СССР (з 1941).

Тв.: Советская Литва на пути расцвета. Вильнюс, 1970; Верность ленинским заветам. Вильнюс, 1988.



Дж.Д.**Снел**.



Ч.П.**Сноу**.

СНІД, скарочаная назва *сіндрому набытага імунадэфіцыту*.

СНІ́ТАВА, вёска ў Іванаўскім р-не Брэсцкай вобл., каля аўтадарогі Іванава—Драгічын. Цэнтр сельсавета і с.-г. кааператыва. За 8 км на З ад г. Іванава, 122 км ад Брэста, 3 км ад чыг. ст. Снітава. 872 ж., 355 двароў (2001). Базавая школа, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, аптэчны пункт, аддз. сувязі. Магіла ахвяр фашызму. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

СНІ́ТКА, с н ы ц ь (Aegopodium), род кветкавых раслін сям. парасонавых. 7 відаў. Пашыраны ў Еўропе і ўмераным поясе Азіі. На Беларусі 1 від — С. звычайная (A. podagraria). Утварае ў шыракалістых лясах густыя зараснікі, трапляецца на высечках, у хмызняках, садах і парках.

Шматгадовыя травы з доўгім паўзучым карэнішчам. Лісце двойчытрайчастае або тройчыперыстае. Кветкі белыя, радзей ружовыя, у парасоніках. Плод — вісланлоднік. Маладое лісце і сцёблы С. звычайнай са своеасаблівым пахам, багатыя вітамінам С, ужываюцца ў ежу. Лек., меданосныя расліны, некат. пустазелле.

А.М.Скуратовіч.



Снітка звычайная.

СНІ́ТКА Андрэй Канстанцінавіч (1866, Вільня — 13.3.1920), археограф, археолаг, этнограф, краязнавец і музеязнавец. Скончыў Рыжскі політэхн. ін-т (1888). Адзін з арганізатараў *Мінскага царкоўнага гісторыка-археалагічнага камітэта* (з 1908 сакратар, з 1909 старшыня), *Мінскага царкоўна-археалагічнага музея* (1908). З 1915 настаўнік гімназіі ў Чарнігаўскай губ. Вёў раскопкі ў Мінскім, Барысаўскім, Ігуменскім пав., у Пінску, Тураве, Слуцку. Абследаваў манастыры Слуцка, Пінска, Турава. Удзельнічаў у выданні зб. дакументаў «*Мінская даўніна*», у 4-м вып. якога апісаў дакументы Слуцкага Свята-Троіцкага (Трайчанскага) манастыра. Апісаў Нікольскую царкву ў Смалявічах, Мінск у 17 ст., склаў радавод слуцкіх князёў Алелькавічаў і інш. Аўтар гісторыі Слуцка (рукапіс захоўваецца ў архіве Ін-та гісторыі Нац. АН Беларусі) і артыкулаў па гісторыі Беларусі, у якіх ухваляў дзейнасць правасл. царквы і царызму на Беларусі з вялікадзярж. клерыкальна-манархісцкіх пазіцый.

А.П.Грыцкевіч.

СНО́У (Snow) Чарлз Персі (15.10.1905, г. Лестэр, Вялікабрытанія — 1.8.1980), англійскі пісьменнік, вучоны, дзярж. і грамадскі дзеяч. Скончыў Кембрыджскі ун-т. Па адукацыі фізік. З 1930 працаваў у Кавендышскай лабараторыі ў Э.*Рэзерфарда*. У 1939—66 на дзярж. пасадах. Асн. яго твор — цыкл раманаў «Чужыя і браты» (т. 1—11, 1940—70), у якім шырокая панарама жыцця англ. грамадства 1910—60-х г. Асн. тэмы — роль навукі і адказнасць вучоных у сучасным свеце, барацьба за ўладу ў сферы палітыкі і кіравання, пераживанні чалавека ў сувязі з перыпетыямі кахання і адзіноты. Аўтар дэтэктыўных раманаў «Смерць пад ветразем» (1932), «Лакіроўка» (1979), біягр. кн. «Тролап» (1975), публіцыстыкі.

Тв.: Рус. пер. — Избр. произв. Т. 1—2. М., 1978.

Літ.: Люксембург А.М. Творческий путь Ч.П.Сноу. Ростов н/Д, 1979; Чарлз Перси Сноу: Биобиблиогр. указ. М., 1977.

СНО́Ў, вёска ў Нясвіжскім р-не Мінскай вобл., на р. Сноўка, на аўтадарозе Нясвіж—Баранавічы. Цэнтр сельсавета і калект. прадпрыемства агракамбінат «Сноў». За 20 км на З ад г. Нясвіж, 120 км ад Мінска, 3 км ад чыг. раз'езда Хвоева. 2567 ж., 1104 двары (2001). Крухмальны з-д. Сярэдняя і мастацтваў школы, Дом культуры, клуб, б-ка, ваен. шпіталь, бальніца, паліклініка, аптэка, цырульня, аддз. сувязі. Малітоўны дом евангельскіх хрысціян-баптыстаў. Брац-

кія могілкі воінаў рус. арміі, якія загінулі ў 1-ю сусв. вайну, магіла чырвонаармейцаў, якія загінулі ў 1918—19 у барацьбе супраць герм. і польскіх акупантаў. Брацкія могілкі сав. воінаў і партызан. Помнікі архітэктуры: касцёл (1760), Свята-Козьмадзям'янаўская царква (1846). *Сноўскі палацава-паркавы ансамбль.*



Сноўскі палацава-паркавы ансамбль.

У пісьмовых крыніцах вядома з мая 1529 як маёнтак паноў Сноўскіх у Навагрудскім ваяв. ВКЛ. З 1564 мястэчка Навагрудскага пав. З пач. 17 ст. ўласнасць Радзівілаў, Рдултоўскіх, Гарцінгаў. З канца 17 ст. дзейнічаў касцёл (з 1866 царква), у 1767—1866 — уніяцкая царква. У час *Барскай канфедэрацыі 1768—72* С. разбураны, у 1785 мястэчка наведаў кароль Станіслаў Аўгуст Панятоўскі. З 1793 у складзе Рас. імперыі. У 1827 пабудаваны палац, у 1836 — бровар. У 1861 — цэнтр воласці, 378 ж., 45 двароў, царква, сінагога, цагельня, у 1865 адкрыта царк.-прыходская школа. З 1921 у складзе Польшчы, цэнтр гміны Нясвіжскага пав., з 1939 у БССР. Са снеж. 1940 вёска, цэнтр сельсавета ў Нясвіжскім р-не Баранавіцкай вобл., 1065 ж., 167 двароў. *В.М.Князева.*

СНО́ЎКА, рака ў Нясвіжскім р-не Мінскай вобл., левы прыток р. Уша (бас. р. Нёман). Даўж. 20 км. Пачынаецца каля в. Малаеды, упадае ва Ушу за 900 м на У ад в. Еськавічы. Рэчышча каналізаванае. Каля вёсак Каменка, Высокая Ліпа (на рацэ) і Тарэйкі (на пойме) створаны сажалкі.

СНО́ЎНІЦА, у беларусаў прылада для снавання нітак асновы для *красён.*

СНО́ЎСКІ ПАЛА́ЦАВА-ПА́РКАВЫ АНСА́МБЛЬ, помнік архітэктуры 1-й пал. 19 ст. ў в. Сноў Нясвіжскага р-на Мінскай вобл. Створаны на раўнінным беразе р. Сноўка. Былы маёнтак маршала Рдултоўскага, ад якога перайшоў да Радзівілаў. У 1-й пал. 19 ст. належаў Абуховічам, з 1854 — барону Густаву Гарцінгу. Пасля рамонту ў 1929 прыстасаваны пад канцылярыю і жыллё афіцэраў польскага корпуса аховы граніцы; выкарыстоўваўся і як казіно. Буйны манум. ансамбль арганізаваны паводле прынцыпу сім.-восевай планіроўкі. Кампазіцыйны цэнтр — мураваны палац (1927, арх. Б. Тычэцкі; класіцызм). Франтальнымі фасадамі ён шырока раскрываецца ў невял. пейзажны парк з сістэмай сажалак і каналаў. 2-павярховы цэнтр. аб'ём злучаны 1-павярховымі бакавымі крыламі-каланадамі з павільёнамі. У цэнтры выцягнутага (даўж. каля 140 м) гал. фасада — 4-калонны іанічны порцік, якому з боку тыльнага фасада адпавядаюць аналагічны порцік меншага памеру і тэраса. Бакавыя рызаліты цэнтр. корпуса вырашаны ў выглядзе «італьян. акна» (арачны праём падзелены карнізам і вузкімі прасценкамі). Бакавыя крылы аздоблены іанічнымі каланадамі, калоны якіх сім. размешчаны ў прасценках прамавугольных аконных праёмаў. У павільёнах выкарыстаны прамавугольныя нішы, сандрыкі аконных праёмаў. У інтэр'еры прамавугольная парадная зала (пл. 100 м²) аздоблена нішамі, скульптурай, каланадай, захавалася кафляная печ. *А.М.Кулагін.*

СНУ́ДЫ, возера ў Браслаўскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Друйка, за 10 км на Пн ад г. Браслаў, уваходзіць у *Браслаўскую групу азёр.* Пл. 22 км², даўж. 8,8 км, найб. шыр. 4,9 км, найб. глыб. 16,5 м, даўж. берагавой лініі 34,4 км. Пл. вадазбору 113 км². Катлавіна складанага тыпу. Схілы выш. да 30 м, на У і ПдУ абрываюцца блізка каля ўрэзу вады. Уздоўж усх. берага цягнецца озавая града, парослая лесам. На З і ПдУ добра выражаны тэрасы, верхняя на выш. 12 м. Берагавая лінія моцна парэзаная. Берагі нізкія, пясчана-галечныя, пераўвільготненыя. Пойма шыр. 5—150 м. Падводная ч. катлавіны мае шэраг упадзін, якія чаргуюцца з пясчанымі водмелямі і 11 а-вамі (агульная пл. 1,6 км², найб. Лакіна, Краснагорка, Турмас, Ліпавец). У засушлівыя гады водмелі агаляюцца, колькасць астравоў павялічваецца да 16. Мелкаводдзе пясчанае, пясчана-галечнае і камяністае, месцамі гліністае. Глыбокія ўчасткі дна высланы сапрапелем. Мінералізацыя вады каля 200 мг/л, празрыстасць да 6,5 м. Мезатрофнае. Уздоўж берага паласа трыснягу і чароту шыр. да 300 м, да глыб. 2 м, падводная расліннасць да глыб. 8 м. Упадаюць больш за 10 ручаёў. На Пд злучана пратокай з воз. *Струста*, на У — канавай з воз. *Воласа Паўночны.* Возера ўваходзіць у зону адпачынку Браслаў і нац. парк *Браслаўскія азёры.*

СНЯГІ́Р, гіль (Pyrrhula pyrrhula), птушка сямейства ўюрковых атр. вераб'інападобных. Пашырана ў Еўразіі, пераважна ў лясной зоне. У род Pyrrhula ўключаюць яшчэ 5 відаў (падвідаў С: азорскі, усурыйскі, шэры і інш. На Беларусі аселая птушка. Нар. назва снягур.

Даўж. да 19 см, маса да 35 г. Верх галавы і хвост чорныя, спіна шэрая, брушка ў самцоў чырв., у самак і маладых асобін бурае. Дзюба чорная, кароткая, тоўстая. Корміцца насеннем і пупышкамі дрэў, кустоў, траў, ягадамі. Адкладвае да 7 яец. *Э.Р.Самусенка.*

СНЯГУ́ЛЬКІ, кветкавая расліна, гл. ў арт. *Снежнаягаднік.*

СНЯ́ДЗІН, вёска ў Петрыкаўскім р-не Гомельскай вобл., каля р. Прыпяць. Цэнтр сельсавета. За 15 км на ПдЗ ад г. Петрыкаў, 205 км ад Гомеля, 28 км ад чыг. ст. Муляраўка. 294 ж., 141 двор (2001). Базавая школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан.



Возера **Снуды**.

СНЯДЭ́ЦКІ (Śniadecki) Анджэй (Енджэй; 30.11.1768, г. Жнін Куяўска-Паморскага ваяв., Польшча — 12.5.1838), польскі і рас. хімік, урач і асветнік, стваральнік навук. школы хімікаў. Брат Я.*Снядэцкага*. Вучыўся ва ун-тах Кракава, Павіі (д-р філасофіі і медыцыны; 1793) і Эдынбурга. У 1797—1822 праф. хіміі, з 1826 — медыцыны Віленскага ун-та, з 1832 праф. Медыка-хірургічнай акадэміі ў Вільні. У навук. даследаваннях і выкладанні хіміі прытрымліваўся антыфлагістычнай тэорыі А.Лавуазье. Стварыў польскую хім. тэрміналогію; аўтар першага універсітэцкага падручніка па хіміі на польскай мове. У кн. «Тэорыя арганічных істот» (т. 1—3, 1804—38) выкладаў ідэю кругавароту элементаў у прыродзе, абмену рэчываў у жывым арганізме. Прапагандаваў і папулярызаваў дасягненні медыцыны, асабліва значэнне надаваў прынцыпам сац. гігіены.

Літ.: Капустинский А.Ф. Андрей Снядецкий и виленская школа химиков // Тр. Ин-та истории естествознания и техники. М., 1956. Т. 12.

СНЯДЭ́ЦКІ (Śniadecki) Ян (29.8.1756, г. Жнін Куяўска-Паморскага ваяв., Польшча — 21.11.1830), польскі і рас. астраном, матэматык і філосаф. Чл.-кар. Пецярбургскай АН (1808). Брат А.*Снядэцкага*. Вучыўся ў Кракаўскай акадэміі і ун-тах Еўропы. У 1792—1803 дырэктар Кракаўскай астр. абсерваторыі, у 1806—25 — *Віленскай астранамічнай абсерваторыі*. Адначасова ў 1806—15 рэктар Віленскага ун-та. Навук. працы па матэматыцы, астраноміі, філасофіі і гісторыі навукі. Вёў сістэм. назіранні Сонца, Месяца, планет і камет, адкрыў (незалежна ад Г.В.*Ольберса*) малую планету Паладу (1802). Даследаваў 4 сонечныя і 2 месяцавыя зацьменні, а таксама рух кометы 1811, зацьменні спадарожнікаў Юпітэра і пакрыцці зорак Месяцам. Падтрымліваў і папулярызаваў вучэнне М.*Каперніка*; пры вырашэнні філас. праблем навукі стаяў на пазіцыях матэрыялістычнага сенсуалізму. Аўтар прац аб жыцці і навук. дзейнасці Каперніка, Ж.Лагранжа і М.Пачобута-Адляніцкага. Удзельнічаў у рабоце *Адукацыйнай камісіі*. Яго асветніцкая дзейнасць спрыяла пашырэнню матэм. і прыродазнаўчых ведаў, яго кнігамі па матэматыцы, астраноміі і геаграфіі карысталіся ў тагачасных навуч. установах.



А.**Снядэцкі**.



Я.**Снядэцкі**.

Літ.: Рыбка Е.В. Ян Снядецкий: (К 200-летию со дня рождения) // Историко-астрономические исследования. М., 1956. Вып. 2; Ченакал В.Л. Ян-Батист Снядецкий и Иоганн-Элерт Боде // Там жа. 1966. Вып. 9; Библиография русской астрономической литературы 1800—1900 гг. М., 1968 (Тр. Гос. астроном. ин-та; Т. 37); Bartnicka K. Działalność edukacyjna Jana Śniadeckiego. Wrocław, 1980. *А.І.Болсун.*

СНЯ́РДВЫ (Śniardwy), самае вял. возера ў Польшчы. Уваходзіць у групу *Мазурскіх азёр*. Пл. 113,8 км². Глыб. да 23 м. Берагі звілістыя, нізкія, укрыты хваёвым лесам або забалочаныя. Шмат астравоў. Сцёк праз р. Піса ў р. Нараў (бас. Віслы). Замярзае. Суднаходства, рыбалоўства, водны турызм.

СНЯТКО́Ў Яўген Васілевіч (1891, г. Тула, Расія — 1940), бел. фізік. Канд. фіз.-матэм. н. (1936), праф. (1933). Скончыў Маскоўскі ун-т (1912). У 1912—19 выкладаў фізіку і матэматыку ў Мінскай гімназіі. У 1920—21 у Мінскім політэхн. ін-це, з 1921 у БДУ (з 1935 заг. кафедры). Навук. працы па вывучэнні працэсаў награвання дысперсных і калоідных асяроддзяў у электрычных палях звышвысокіх частот. Аўтар першага на бел. мове навуч. дапаможніка па радыётэхніцы.

Тв.: Курс радыётэхнікі. Мн., 1933; Тэлебачанне і тэлефатаграфія. Мн., 1934. *А.А.Гусак.*

СНЯТО́К, рыба сямейства корушкавых, гл. ў арт. *Корушка*.

СО́БАЛЕЎ Іван Паўлавіч (11.11.1907, в. Шапуры Віцебскага р-на — 27.10.1989), Герой Сав. Саюза (1943). Скончыў Ленінградскае ваенна-інж. вучылішча (1931), Вышэйшую афіцэрскую інж. школу (1952). У Чырв. Арміі з 1927. У Вял. Айч. вайну на фронце з 1941. Камандзір асобнага матарызаванага пантонна-маставога батальёна падпалк. С. вызначыўся ў вер. 1943 пры фарсіраванні Дняпра ў Днепрапятроўскай вобл. (Украіна). Да 1955 у Сав. Арміі. Ганаровы грамадзянін г. Віцебск.

СО́БАЛЕЎ Леанід Сяргеевіч (21.7.1898, г. Іркуцк, Расія — 17.2.1971), рускі пісьменнік. Герой Сац. Працы (1968). Скончыў Петраградскае марское вучылішча. Друкаваўся з 1926. Раман «Капітальны рамонт» (1932—62), зб. апавяданняў «Марская душа» (1942, Дзярж. прэмія СССР 1943) пра рас. флот, подзвігі маракоў. Аўтар аповесці «Зялёны прамень» (1954), трагедыі «Абай» (1941, з М.Аўэзавым), кн. нарысаў «Дарогамі перамогі» (1944—45), «Святло перамогі» (1968), зб-каў публіцыстычных арт. «Вецер часу» (1970), арт. і выступленняў пра л-ру «На галоўным курсе» (1969), кінасцэнарыяў і інш. Апавяданне С. «Салавей» на бел. мову пераклаў В.Рабкевіч.



Снягір: 1 — самка; 2 — самец.

Тв.: Собр. соч. Т. 1—6. М., 1972—74.

Літ.: Сурганов В.А. Леонид Соболев. М., 1962.

СО́БАЛЕЎ Мікалай Уладзіміравіч (н. 28.5.1935, С.-Пецярбург), расійскі геолаг. Акад. Рас. АН (1990; чл.-кар. 1981). Сын У.С.*Собалева*. Скончыў Львоўскі ун-т (1958). З 1960 у Ін-це геалогіі і геафізікі Сібірскага аддз. АН СССР. Навук. працы ў галіне мінералогіі і петралогіі. Распрацаваў мінералагічныя крытэрыі алмазаноснасці кімберлітаў. Ленінская прэмія 1976.

Тв.: Глубинные включения в кимберлитах и проблема состава верхней мантии. Новосибирск, 1974.



І.П.**Собалеў**.



Л.С.**Собалеў**.



С.Л.**Собалеў**.

СО́БАЛЕЎ Сяргей Львовіч (6.10.1908, С.-Пецярбург — 3.1.1989), расійскі матэматык і механік. Акад. АН СССР (1939; чл.-кар. 1933). Герой Сац. Працы (1968). Скончыў Ленінградскі ун-т (1929). З 1932 у Матэм. ін-це, з 1943 у Ін-це атамнай энергіі, з 1957 дырэктар Ін-та матэматыкі Сібірскага аддз. АН СССР. Адначасова ў 1935—57 у Маскоўскім ун-це. Навук. працы па аналітычнай тэорыі дыферэнцыяльных ураўненняў, варыяцыйным злічэнні, тэорыі пругкасці, матэм. фізіцы, функцыянальным аналізе і выліч. матэматыцы. Дзярж. прэміі СССР 1941, 1951, 1953, 1986. Залаты медаль імя Ламаносава АН СССР 1989.

СО́БАЛЕЎ Уладзімір Сцяпанавіч (30.5.1908, г. Луганск, Украіна — 1.9.1982), расійскі геолаг. Акад. АН СССР (1958). Герой Сац. Працы (1978). Скончыў Ленінградскі горны ін-т (1930). Да 1941 у Цэнтр. н.-д. геолагаразведачным ін-це, адначасова ў 1931—41 і 1943—45 у Ленінградскім горным ін-це. У 1941—43 у Іркуцкім, з 1945 у Львоўскім ун-тах, адначасова з 1947 у Ін-це геалогіі карысных выкапняў АН Украіны. З 1958 у Ін-це геалогіі і геафізікі Сібірскага аддз. АН СССР, з 1982 у Мінералагічным музеі імя А.Я.Фермсана. Навук. працы па мінералогіі сілікатаў, тэарэт. петралогіі, магматызме і метамарфізме горных парод. Дзярж. прэмія СССР 1950. Ленінская прэмія 1976.

Тв.: Физико-химические основы петрографии изверженных пород. М., 1961 (разам з А.М.Заварыцкім); Фации метаморфизма. М., 1970 (у сааўт.); Петрология траппов: Избр. тр. Новосибирск, 1986.

СО́БАЛЕЎ Уладзімір Фёдаравіч (н. 20.6.1941, Мінск), бел. вучоны ў галіне тэхналогіі металаў. Д-р тэхн. н. (1992), праф. (1994). Скончыў БПІ (1963). З 1968 у БПА. Навук. працы па матэм. мадэліраванні фіз.-хім. працэсаў і ўласцівасцей метал. сістэм. Распрацаваў метады даследавання і прагназіравання ўласцівасцей сплаваў на аснове тэорыі распазнавання вобразаў, фіз. мадэлі крышталізацыі сплаваў.

Тв.: О термодинамических характеристиках границ раздела микронеоднородности, определяющих взаимную растворимость компонентов двойных систем (разам з А.М.Чычко) // Расплавы. 1999. № 4.

СО́БАЛЬ (Martes zibellina), млекакормячае роду куніц сям. куніцавых атр. драпежных. Пашыраны ў Еўразіі. Утварае некалькі геагр. форм (далёкаўсходні, забайкальскі, камчацкі і інш.). Жыве ў тайзе. На Беларусі трапляўся да 16 ст.; вынішчаны.

Даўж. цела да 58 см, хваста да 19 см, маса да 1,9 кг. Самцы буйнейшыя за самак. Лапы кароткія, шырокія, падэшвы ўкрыты поўсцю. Футра густое, пушыстае, шаўкавістае. Афарбоўка ад жоўта-бурай да чорна-бурай. На горле і грудзях жоўтая пляма. Усёедны. Нараджае да 7 дзіцянят. Пры скрыжаванні з куніцай утварае гібрыды — кідасы (кідусы). Аб'ект промыслу і зверагадоўлі. *Э.Р.Самусенка.*



Собаль.

СО́БАЛЬ Спірыдон (? — каля 1645), бел. друкар. З сям'і бургамістра г. Магілёва. У пач. 17 ст. настаўнік, потым рэктар Магілёўскай брацкай школы. З 1624 настаўнік Кіеўскай брацкай школы і Кіева-Магілянскай акадэміі. У 1628 у Кіеве адкрыў друкарню і выдаў некалькі кніг маральна-павучальнага і рэліг. зместу. Вярнуўся на Беларусь і ў 1630 прыняў удзел у заснаванні *Куцеінскай друкарні*, узначальваў яе да 1632. Выдаў там кірыліцай «Брашна духоўнае», «Малітвы паўсядзённыя», «Буквар» («**Бꙋкварь сирѣчь**, начало **оученіѧ дѣтем** начинающим чтению извыкати», 1631) і «Часаслоў» (1632). С. упершыню ўжыў назву «буквар», а яго кніга па навучанні першапачатковай грамаце наз. «Азбука». У адкрытай ім друкарні ў Буйнічах (пад Магілёвам) выдаў «Псалтыр» (1635), у *Магілёўскай брацкай друкарні* — «Буквар» («**Бꙋкварь ѩзыка** славеньска», 1636), «Псалтыр» (1637), «Тастамент» (1638). Падтрымліваў цесныя сувязі з рус., укр., польскімі друкарамі. У 1637 маскоўскі друкар В.Бурцаў набыў у С. друкарскія прылады.

Літ.: Зернова А.С. Белорусский печатник Спиридон Соболь // Книга: Исслед. и материалы. М., 1965. Сб. 10; Мацюк О.Я. Новые документы о типографе Спиридоне Соболе // Федоровские чтения, 1973. М., 1976; Исаевич Я.Д. Преемники первопечатника. М., 1981; Голенченко Г.Я. Новые материалы по истории культурных связей Белоруссии с Украиной и Россией в конце XVI — первой половине XVII в. // Книга в Белоруссии: Книговедение, источники, библиогр. Мн., 1983; Ботвинник М.Б. Откуда есть пошел букварь. Мн., 1983.

М.Б.Батвіннік.

СО́БАТ, Бахр-эль-Асфар, рака ў Судане (вярхоўі ў Эфіопіі), правы прыток р. Белы Ніл. Утвараецца ад сутокаў рэк Бара і Пібар. Даўж. ад вытоку р. Бара 730 км, пл. бас. каля 350 тыс. км^2. Цячэ па горнай і ўзгорыстай мясцовасці. Мнагаводная летам і восенню, зімой і вясной многія прытокі перасыхаюць. Сярэдні расход вады 412 м^3/с. Суднаходная ў сезон дажджоў ад г. Гамбела.

СО́БЕЛЬСКАЕ ВАДАСХО́ВІШЧА, У Лунінецкім р-не Брэсцкай вобл., каля в. Чырвоная Воля. Створана ў 1986. Пл. 2,9 км^2, даўж. 2,2 км, найб. шыр. 1,5 км, найб. глыб. 5,8 м, аб'ём вады 14,2 млн. м^3. Наліўное, вада падаецца з Грычынскага канала. Ваганні ўзроўню вады на працягу года да 5,7 м. Выкарыстоўваецца для арашэння с.-г. угоддзяў.

СО́БІН Уладзімір Мартынавіч (н. 12.9.1940, г. Орша Віцебскай вобл.), бел. вучоны ў галіне цепла- і масаабмену. Д-р тэхн. н. (1991), дацэнт (1979). Скончыў Тульскі політэхн. ін-т (1965). З 1969 у Бел. тэхнал. ін-це, з 1988 у Медыка-біятэхнал. НДІ, з 1994 на выкладчыцкай рабоце. Навук. працы па гідрадынаміцы і цепламасаабмене ў адна- і двухфазных патоках вадкасцей пры даследаванні энергетычных, хіміка-тэхнал. і мікрабіялагічных працэсаў і іх матэм. апісанні пры дапамозе дыферэнцыяльных ураўненняў з частковымі вытворнымі.

Тв.: Тепломассообмен в пленочных течениях при осложненных условиях: (Приближ. методы расчета). Мн., 1994.

СО́БІНАЎ Леанід Віталевіч (7.6.1872, г. Яраслаўль, Расія — 14.10.1934), рускі спявак (лірычны тэнар), прадстаўнік

рус. класічнай вак. школы. Нар. арт. Рэспублікі (1923). Скончыў юрыд. ф-т Маск. ун-та (1894), муз.-драм. вучылішча Маскоўскага філарманічнага т-ва (1897). З 1897 у Вял. т-ры ў Маскве (у 1917—18 і ў 1921 дырэктар). У дасканаласці валодаў мастацтвам італьян. *бельканта*. У аснове яго мастацтва высокая адухоўленасць, паэтызацыя муз. вобраза, адзінства бездакорнага вак. майстэр-



Л.В.**Собінаў**.

ства і драм. асэнсаванай ігры. Адзін з лепшых выканаўцаў партый Ленскага («Яўген Анегін» П.Чайкоўскага) і Лаэнгрына («Лаэнгрын» Р.Вагнера) на сусв. сцэне. З інш. партый: Сінадал («Дэман» А.Рубінштэйна), Берандзей, Ляўко («Снягурачка», «Майская ноч» М.Рымскага-Корсакава), Рудольф («Багема» Дж.Пучыні), Альфрэд, Герцаг («Травіята», «Рыгалета» Дж.Вердзі). Вёў актыўную канцэртную дзейнасць. Прапагандыст рус. вак. лірыкі, тонкі інтэрпрэтатар класічнай камерна-вак. музыкі. Канцэртны рэпертуар складалі творы М.Глінкі, Чайкоўскага, С.Рахманінава, Л.Бетховена, Р.Шумана, Ф.Шуберта, Ш.Гуно.

Літ.: Л.В.Собинов. Т. 1—2. М., 1970; Владыкина-Бачинская Н.М. Л.В.Собинов. 3 изд. М., 1972; Воспоминания о Л.В.Собинове. Ярославль, 1985.

Н.В.Сазановіч.

СОВАПАДО́БНЫЯ (Strigiformes), атрад птушак. 2 сям.: савіныя, або совы нармальныя, і сіпухавыя (Tytonidae). 30 родаў, 144 віды. Пашыраны ўсюды, акрамя Антарктыды і некат. акіянічных астравоў. Жывуць ад тундры да пустынь і гор, большасць у лясах. На Беларусі 13 відаў з 10 родаў; 9 відаў у Чырв. кнізе: *балотная сава*, *няясыці* (2 віды), *сіпуха*, *сплюшка*, *сычы* (3 віды), пугач звычайны (гл. *Пугачы*). У Чырв. кнізе МСАП 21 від.

Даўж. цела да 84 см, размах крылаў да 2 м, маса да 4,5 кг. Самкі буйнейшыя за самцоў. Апярэнне мяккае, рыхлае, шэрае, бурае ці рыжаватае, з цёмнымі і светлымі плямамі і стракацінамі. Вочы вял., накіраваны ўперад, у большасці абкружаны тваравым дыскам з дробных пёраў. Зрок бінакулярны. Вушныя адтуліны вялікія. Шыя рухомая, галава паварочваецца на 180—270°. Крылы шырокія, закругленыя, хвост кароткі. Дзюба кручкападобная, вострая, кароткая. Лапы моцныя, з вострымі і вял. кіпцюрамі, чатырохпальцыя. Цэўкі анераныя. Манагамы. Адкладваюць 4—5 (да 14) яец. Корм пераважна жывёльны. Гл. таксама *Белая сава*, *Няясыць барадатая*, *Пугач рыбны*. Літ. гл. да арт. *Савіныя*.

«СОВЕ́ТСКАЯ БЕЛОРУ́ССИЯ», штодзённая грамадска-паліт. газета. Заснавальнікі — Адміністрацыя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і рэдакцыйны савет. Выдаецца з 2.8.1927 у Мінску на рус. мове спачатку пад назвай «Рабочий» як орган ЦК КП(б)Б, з 1937 сучасная назва. У 1938—43 орган ЦК і Мінскага абкома КП(б)Б, у 1943—48 — орган ЦК КП(б)Б, Савета Міністраў і Прэзідыума Вярх. Савета БССР, у 1948—52 — орган ЦК і Мінскага абкома КП(б)Б, Савета Міністраў і Прэзідыума Вярх. Савета БССР, у 1952—91 — орган ЦК КПБ, Вярх. Савета і Савета Міністраў БССР. У 1941—44 выходзіла на бел. мове пад назвай «*Савецкая Беларусь*» (у прыфрантавой паласе, потым у Маскве, са снеж. 1943 у Гомелі, з 1944 зноў у Мінску). З 2000 выдаецца поўнакаляровым друкам. Асвятляе пытанні грамадска-паліт., эканам., міжнар. жыцця, дзейнасць органаў заканад. і выканаўчай улады Рэспублікі Беларусь, праблемы і шляхі развіцця культуры, навукі, сельскай гаспадаркі, фермерскага, прадпрымальніцкага гаспадарання, прынцыпы буд-ва Саюзнай дзяржавы. Публікуе ўказы і распараджэнні кіраўніка дзяржавы, заканад. акты, факты і каментарыі аб рабоце дзярж. спецслужб, аналіт. матэрыялы па праблемах экалогіі, адукацыі, маралі, права, гісторыі Беларусі, рэпартажы пра найб. значныя сац., культ., спарт. падзеі і інш. З 1999 рэдакцыі газет «С.Б.» і «Российская газета» выдаюць штотыднёвы дадатак «СОЮЗ. Беларусь—Россия». *Т.У.Люковіч.*

«СОВЕ́ТСКАЯ ПРА́ВДА», грамадска-палітычная газета *Абласнога выканаўчага камітэта Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў Заходняй вобласці* і *фронту*. Выходзіла з 1(14).12.1917 да 6.3.1918 у Мінску (53 нумары) і Смаленску (9 нумароў) на рус. мове штодзённа. Рэдактар А.А.Белазёраў, з 27.1(9.2).1918 — К.І.*Ландар*. Асвятляла мясц. жыццё, асн. міжнар. падзеі. Друкавала дэкрэты і распараджэнні цэнтр. і мясц. ўрада, загады Вярх. і зах.-франтавога камандавання, начальнікаў Мінскага гарнізона, міліцыі, справаздачы пленумаў Аблвыкамзаха, рэзалюцыі, паведамленні аб ходзе сац. перабудовы ў Мінскай і Віленскай губ. Змяшчала аб'явы ўладных структур, грамадска-паліт. арг-цый левага кірунку, прыватных асоб. Публікавала фельетоны Г.Ф.Усцінава, вершы Дз.Беднага і інш. Крытыкавала эсэраўскія, меншавіцкія і інш. выданні дэмакр. кірунку. Выступіла супраць арганізатараў і ўдзельнікаў Усебел. з'езда, кіраўнікоў Цэнтр. бел. вайсковай рады і Вял. бел. рады, праводзіла агітацыю супраць узбр. выступлення 1-га Польскага корпуса. 19.2.1918 у сувязі з наступленнем на Мінск часцей Ю.Доўбар-Мусніцкага эвакуіравана ў Смаленск. *М.Я.Сяменчык.*

«СОВЕ́ТСКИЕ АРХИ́ВЫ», навуковы часопіс, орган Гал. архіўнага ўпраўлення пры СМ СССР. Выдаваўся ў 1966—91 у Маскве пры ўдзеле Ін-та марксізму-ленінізму пры ЦК КПСС і Ін-та гісторыі АН СССР. Выходзіў 6 разоў на год. Яго папярэднікамі былі час. «Архивное дело» (1923—41), «Информационный бюллетень Главного архивного управления при СМ СССР» (1956—58), навукова-інфармацыйны бюлетэнь «Вопросы архивоведения» (1959—65). Друкаваў архіўныя дакументы, уводзіў у навук. ўжытак новыя крыніцы шляхам публікацыі аглядаў архіўных комплек-



1



2



3



4

Совападобныя: 1 — сава пячорная, або сыч трусіны; 2 — сычык-эльф, або сычык кактусавы; 3 — сава афрыканская лясная; 4 — сава вушастая.

саў (фондаў, вопісаў, дакументаў), знаёміў з гіст. даследаваннямі, заснаванымі на архіўных дакументах, зборнікамі дакументаў, навуч. дапаможнікамі па архіва-, дакумента-, крыніцазнаўстве і інш. У часопісе змяшчаліся артыкулы і паведамленні бел. гісторыкаў і архівістаў па актуальных праблемах археаграфіі. З 1992 выдаецца пад назвай «Отечественные архивы».

Літ.: Библиографический указатель материалов, опубликованных в журнале «Советские архивы» (1966—1986 гг.). М., 1989.

М.Ф.Шумейка.

«СОВРЕМЕ́ННИК», рускі літаратурны і грамадска-паліт. часопіс. Выдаваўся ў 1836—66 у Пецярбургу; да 1843 4 разы ў год, потым штомесячна. Рэдактар і заснавальнік А.Пушкін. Ён залучыў да ўдзелу ў часопісе У.Адоеўскага, П.Вяземскага, М.Гогаля, В.Жукоўскага, А.Кальцова, Ф.Цютчава.

Пасля смерці Пушкіна «С.» выдавалі Вяземскі, Жукоўскі і інш. У 1838 належаў П.Плятнёву. З 1847 (выдаўцы М.Някрасаў і І.Панаеў, ідэйны кіраўнік В.Бялінскі) «С.» набыў рэв.-дэмакр. кірунак. Выступаў супраць рыгонніцтва, прапагандаваў ідэі утапічнага сацыялізму, адстойваў метад крытычнага рэалізму ў л-ры. У ім супрацоўнічалі М.Агароў, А.Герцэн, Дз.Грыгаровіч, А.Майкаў, Л.Талстой, І.Тургенеў і інш. З прыходам М.Чарнышэўскага (1853) і М.Дабралюбава (1856) «С.» стаў цэнтрам прапаганды ідэй рэв. дэмакратыі. У чэрв. 1853—55 у «С.» друкаваліся нарысы П.Шпілеўскага «Падарожжа па Палессі і Беларускім краі», якія асвятлялі жыццё бел. народа, яго гісторыю.

«С.» палемізаваў са славянафіламі, у т.л. газ. «День» І.Аксакава, якая нібыта абараняла беларусаў ад паланізацыі і акаталічвання, але рабіла гэта з пазіцый самадзяржаўя. З крытыкай славянафілаў выступіў Чарнышэўскі ў арт. «Нацыянальная бестактоўнасць», М.Салтыкоў-Шчадрын у арт. «Наша грамадскае жыццё», Дабралюбаў у арт. «Рысы для характарыстыкі рускага простанароддзя». Яны адстойвалі правы на развіццё бел. нац. культуры, указвалі на неабходнасць вывучэння жыцця і побыту бел. народа. Закрыты ва ўмовах паліт. рэакцыі.

Літ.: История русской журналистики XVIII—XIX вв. 3 изд. М., 1973; Булацкі Р.В., Сачанка І.І., Говін С.В. Гісторыя беларускай журналістыкі. Мн., 1979.

Н.А.Сніцарава.

СО́ВЫ САПРА́ЎДНЫЯ, сямейства птушак, гл. *Савіныя*.

СОГД, Сагдыяна, у старажытнасці вобласць у бас. рэк Зераўшан і Кашкадар'я, якую насялялі *сагдыйцы* (на тэр. сучасных Узбекістана і Таджыкістана). Найб. вядомы горад С. — Мараканда (Самарканд). У 6—4 ст. да н.э. ўваходзіў у склад *Ахеменідаў дзяржавы*. Насельніцтва С. на чале са *Спітаменам* паказала ў 329—328 да н.э ўпартае супраціўленне войску *Аляксандра Македонскага*. Пасля смерці апошняга (323 да н.э.) — у складзе дзяржавы *Селеўкідаў*, з пач. 3 ст. да н.э. — *Грэка-Бактрыйскага царства*. У 1—4 ст. н.э. — ч. *Кушанскай дзяржавы*. У 4—5 ст. заваяваны *эфталітамі*, у 6—7 ст. — цюркамі; у гэты час на тэр. С. існавалі аўт. мясц. княствы. У канцы 7 — пач. 8 ст. завяваны арабамі, якія далі краіне назву *Маверанахр*. У старажытнасці цераз С. праходзілі важныя гандлёвыя шляхі, якія звязвалі Кітай з Б. Усходам (гл. *Вялікі шаўковы шлях*).

Літ.: Джалилов А. Согд накануне арабского нашествия и борьба согдийцев против арабских завоевателей в первой половине VIII в. Сталинабад, 1961; Смирнова О.И. Очерки из истории Согда. М., 1970; Якубов Ю. Раннесредневековые сельские поселения горного Согда: (К пробл. становления феодализма). Душанбе, 1988; Обельченко О.В. Культура античного Согда: По археол. данным, VII в. до н.э. — VII в. н.э. М., 1992.

СО́ГНЕ-ФІЁРД (Sogne fjord), заліў Паўночнага м. каля паўд.-зах. берагоў Скандынаўскага п-ва, у Нарвегіі; адзін з найб. фіёрдаў Еўропы. Даўж. 204 км, шыр. да 6 км, глыб. да 1208 м. Берагі выш. да 1500 м, стромкія, скалістыя. Утварае бакавыя адгалінаванні, у некат. з іх апускаюцца ледавікі. Прылівы паўсутачныя (1,5 м). Парты: Хёянгер, Лейкангер.

СО́ДА, тэхнічная назва *карбанатаў* натрыю. Бязводны натрыю карбанат Na_2CO_3 наз. кальцыніраванай С., яе крышталегідрат $Na_2CO_3{\cdot}10H_2O$ (дэкагідрат) — крышт. С., гідракарбанат $NaHCO_3$ — пітной, ці харч. С. У прыродзе трапляецца ў выглядзе грунтавых расолаў, рапы ў азёрах і мінералаў — натрону $Na_2CO_3{\cdot}10H_2O$, тэрманатрыту $Na_2CO_3{\cdot}H_2O$, троны $Na_2CO_3{\cdot}NaHCO_3{\cdot}2H_2O$.

С. кальцыніраваная — бясколерныя крышталі, $t_{пл}$ 858 °С. Гіграскапічная, растварацца ў вадзе (растворы маюць моцнашчолачную рэакцыю). Атрымліваюць пераважна награваннем $NaHCO_3$, што ўтвараецца пры карбанізацыі воднага раствору хларыду натрыю, насычанага аміякам, а таксама з прыродных пакладаў, саляных расолаў. Выкарыстоўваюць у вытв-сці шкла, мыла і інш. мыйных сродкаў, алюмінію, для атрымання інш. злучэнняў натрыю і пігментаў, ачысткі нафтапрадуктаў, пры варцы цэлюлозы. С. пітная — белы крышт. парашок, які пры 100—150 °С раскладаецца. Атрымліваюць насычэннем воднага раствору Na_2CO_3 вуглякіслым газам. Выкарыстоўваюць як разрыхляльнік цеста ў хлебапякарнай і кандытарскай прам-сці, у вытв-сці безалкагольных напіткаў, штучнай мінер. вады, як лек. сродак і інш.

СО́ДАЛЬ Уладзімір Ільіч (н. 13.9.1937, в. Мормаль Жлобінскага р-на Гомельскай вобл.), бел. літаратуразнавец, краязнавец. Скончыў Мінскі пед. ін-т (1963). Настаўнічаў. У 1967—2000 працаваў на Бел. тэлебачанні. Даследуе бел. л-ру і культуру 19—20 ст., жыццёвы і творчы шлях В.І.Дуніна-Марцінкевіча, Ф.Багушэвіча, Я.Купалы, М.Багдановіча, Ядвігіна Ш., Зоські Верас і інш. Аўтар кніг «Людзьмі звацца» (1977), «Пуцявінамі сейбіта» (1982), «Кушлянскі кут», «Сцежкамі Мацея Бурачка» (абедзве 1990), «Жупранская старонка» (1992), «Тут бачу свой край» (1994), «Свіранскія крэскі» (1995), «Карпілаўка» (2001). Складальнік альбомаў «Францішак Бенядзікт Багушэвіч» (1986), «Вінцэнт Якуб Дунін-Марцінкевіч» (1997). Укладальнік зб-каў твораў Багушэвіча «Мая дудка» (1987), «Каму дудка паслушна» (1990). Аўтар сцэнарыяў навучальных дыяфільмаў пра Багушэвіча, Дуніна-Марцінкевіча, К.Каліноўскага і інш.

І.У.Саламевіч.

СО́ДЗІ (Soddy) Фрэдэрык (2.9.1877, г. Істбарн, Вялікабрытанія — 22.9.1956), англійскі радыяхімік. Чл. Лонданскага



Ф.Содзі.

каралеўскага т-ва (1910). Замежны чл.-кар. АН СССР (1924). Скончыў Оксфардскі ун-т (1896). У 1900—02 ва ун-це Мак-Гіла (г. Манрэаль). З 1904 ва ун-це г. Глазга, з 1914 праф. Абердзінскага, у 1919—36 Оксфардскага ун-таў. Навук. працы па даследаванні радыеактыўнасці. Распрацаваў разам з Э.*Рэзерфардам* асновы тэорыі радыеактыўнага распаду (1903). Даказаў утварэнне гелію пры радыеактыўным распадзе радыю і радону (разам з У.*Рамзаем*; 1903). Увёў паняцце аб ізатопах, сфармуляваў правіла зрушэння, якое дазваляе прадказаць месца ў перыяд. сістэме элемента — прадукту радыеактыўнага распаду (1913; адначасова з К.Фаянсам). Адкрыў пратактыній (1917; разам з Дж.Кранстанам, незалежна ад О.*Гана* і Л.*Майтнер*). Нобелеўская прэмія 1921.

СО́ЕВЫ АЛЕ́Й, раслінны тлусты алей з зярнят *соі*. Атрымліваюць прасаваннем ці экстрагаваннем арган. растваральнікамі. Светла-жоўтая вадкасць, шчыльн. 924—934 кг/м^3 (15 °С), т-ра застывання ад -8 да -18 °С. Паўвысыхальны алей (гл. *Алеі*). Выкарыстоўваюць як харч. прадукт, у вытв-сці маргарыну, мыла, а таксама пакосту, алкідных смол, алейных лакаў, мыйных сродкаў.

СОЖ, рака ў Смаленскай вобл. Расіі, у Магілёўскай і Гомельскай абл. і на мяжы Беларусі з Расіяй і з Украінай, левы прыток р. Дняпро. Даўж. 648 км, пл. вадазбору 42,1 тыс. км^2, у межах Беларусі адпаведна 493 км і 21,5 тыс. км^2. Пачынаецца за 12 км на Пд ад г. Смаленск, вусце каля г.п. Лоеў. Верхняе цячэнне на паўд.-зах. ускраіне Смаленскага ўзв., сярэдняе — на Аршанска-Магілёўскай раўніне, ніжняе — у межах Гомельскага Палесся. Даліна пераважна трапецападобная, ад вытоку да вуся р. Проня — выразная, глыбокаўрэзаная (20—30 м). Шыр. ў вярхоўі 0,3—3 км, пры зліцці з далінай р. Дняпро — да 20 км. Схілы спадзістыя,

умерана стромкія (радзей стромкія), выш. 15—25 м (месцамі да 40 м), парэзаны ярамі, лагчынамі, далінамі прытокаў. Правы схіл больш адкрыты, левы зарос лесам і хмызняком. На Беларусі амаль на ўсім працягу вылучаюцца поймы з нізкім (1,5—2,5 м над урэзам вады) і высокім (3—4 м) узроўнем і 2 надпоймавыя тэрасы. Пойма двухбаковая, месцамі левабярэжная або чаргуецца па берагах, шыр. 60—400 м у вярхоўі, пры ўпадзенні р. Асцёр 4 км, ад упадзення р. Проня да вусця 0,7—6 км. Паверхня яе перасечана лагчынамі і старыцамі. Затапляецца на 5—10 сут на глыб. 0,5—2,5 м, у вусцевай ч. — да 4—5 м. Рэчышча звілістае, да ўпадзення р. Проня шыр. 15—180 м, на астатнім працягу 90—230 м. Каля г. Слаўгарад, дзе на правабярэжжы знаходзяцца канцавыя марэны, утварае буйны выгін. У ніжнім цячэнні вял. колькасць лукавін, рукавоў, старыц. Да г. Гомель трапляюцца астравы (даўж. 30—300 м, шыр. 10—50 м). Шыр. ракі ў вярхоўі 40—80 м, у нізоўі 90—125 м, месцамі да 230 м. Пераката ў выніку падтрымання суднаходных глыбінь выражаны слаба. Дно роўнае, пясчанае, радзей пясчана-ілістае. Берагі да вусця р. Проня пераважна стромкія, выш. 1,5—4 м, ніжэй — спадзістыя; на лукавінах, дзе рэчышча падыходзіць да карэннага берага (напр., каля в. Гайшын Слаўгарадскага р-на) стромкія, выш. 12—15 м, месцамі да 35 м. Ніжэй г. Ветка па берагах пясчаныя пляжы. Асн. прытокі: Віхра, Волчас, Проня, Уза (справа), Хмара, Асцёр, Беседзь, Іпуць, Вуць (злева). Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Ледастаў з пач. снеж. да канца сак. — пач. красавіка. Найб. таўшчыня лёду 65 см. Веснавы крыгаход 3—5 сут. На перыяд разводдзя прыпадае каля 57% гадавога сцёку. Пад'ём узроўню вады пачынаецца ў канцы сак. — пач. красавіка, у верхнім цячэнні доўжыцца 10—15 сут, у нізоўі 20—25 сут. Сярэдняя выш. над межанным узроўнем 4—5 м, найб. 7,5 м. Летне-асенняя межань часта парушаецца дажджавымі паводкамі, якія доўжацца 25—35 сут. Зімовыя ўзроўні на 10—20 см вышэй за летнія, у нізоўі ў асобныя гады павышаюцца да 2,5 м. Сярэднегадавы расход вады каля г. Слаўгарад 105 м^3/с, каля г. Гомель 210 м^3/с, у вусці 219 м^3/с. Выкарыстоўваецца для водазабеспячэння. Рэгулярнае суднаходства ад г. Слаўгарад, у перыяд высокіх узроўняў ад в. Барысавічы Клімавіцкага р-на. У сярэднім і ніжнім цячэнні С. працякае праз тэр., забруджаныя радыёнуклідамі ў выніку аварыі на Чарнобыльскай АЭС. На рацэ гарады: Крычаў, Чэрыкаў, Слаўгарад, Чачэрск, Ветка, Гомель (Беларусь). Уздоўж берагоў біял. заказнікі: Веткаўскі, Струменскі, Чачэрскі, Шабрынскі. Зоны адпачынку. *А.А.Макарэвіч.*



Рака **Сож**.

СО́ЖСКАЕ ЗЛЕДЗЯНЕ́ННЕ, маскоўскае зледзяненне, рыскае 2-е зледзяненне, зледзяненне, якое доўжылася каля 110 тыс. гадоў з канца *шклоўскага міжледавікоўя* да пачатку *муравінскага міжледавікоўя*; перадапошняе зледзяненне на Беларусі ў плейстацэне. У час найб. пашырэння сожскае ледавіковае покрыва 3 вял. патокамі (нёманскім, мінскім, дняпроўскім) дасягала паўн. межаў Бел. Палесся. Яго адклады прадстаўлены пародамі: марэннымі (валунныя супескі і суглінкі), флювіягляцыяльнымі (пясок, жвір, пясчана-жвіровыя сумесі і інш.) і азёрна-ледавіковымі (стужачныя гліны, супескі, пяскі); іх магутнасць месцамі да 80 м. У цэнтр. ч. Беларусі залягаюць з паверхні, таксама ў складзе Гродзенскага, Навагрудскага, Мінскага, Ашмянскага, Аршанскага і інш. узвышшаў Бел. грады, Цэнтральнабярэзінскай і Аршанска-Магілёўскай і інш. раўнін (гл. адпаведныя арт.). У паласе краявых ледавіковых утварэнняў на Бел. градзе самая высокая адзнака — *Дзяржынская гара* (345 м), па ёй праходзіць гал. еўрап. Балтыйска-Чарнаморскі водападзел. Краявыя ледавіковыя ўтварэнні Гродзенскага, Навагрудскага і Ашмянскага ўзвышшаў маюць складкава-лускаватую будову. Адступанне С.з. адбывалася стадыйна (Ашмянскі, Магілёўскі, Слаўгарадскі стадыялы), адзначана некалькімі зонамі краявых ледавіковых утварэнняў і звязаных з імі ўчасткамі мёртвага лёду. На Пн сожскія адклады пахаваны пад тоўшчай парод *паазерскага зледзянення*. На Пд яны пашыраны ў выглядзе зандраў, якія залягаюць на паверхні ў Палескай нізіне. Сожскі ледавік актыўна ўздзейнічаў на падсцілаючыя пароды, што прывяло да ўзнікнення глыбокіх ледавіковых лагчын, гляцыядыслакацый і адорвеняў палеазойскіх, мезазойскіх і кайназойскіх парод. Большасць даследчыкаў звязваюць утварэнне адкладаў С.з. з сожскай стадыяй *дняпроўскага зледзянення*. *А.Ф.Санько.*

СО́ЖСКАЕ РАДО́ВІШЧА МЕ́ЛУ. У Чэрыкаўскім р-не Магілёўскай вобл., каля вёсак Рэчыца і Міхалін. Пластавы паклад звязаны з адкладамі туронскага яруса (верхні мел). Мел белы, светла-шэры, аднародны, шчыльны, месцамі трэшчынаваты, у верхняй ч. запясочаны, у ніжняй ч. пераходзіць у мергель. Разведаныя запасы 109 млн. т, перспектыўныя 127,4 млн. т. Магутнасць карыснай тоўшчы (пройдзеная) 3,7—26,7 м, ускрышы (пяскі, супескі, суглінкі) 0,2—9,5 м. Мел прыдатны на выраб цэменту і буд. вапны. *А.П.Шчураў.*

СО́ЖСКАЯ КУЛЬТУ́РА, археалагічная культура позняга мезаліту (6—5-е тыс. да н.э.) у бас. Верхняга Дняпра. Названа ад месцазнаходжання найб. даследаванай стаянкі Горкі на Сажы. Вылучана ў самастойную культуру ў 1960-я г. У.Ф.Ісаенкам па матэрыялах раскопак К.М.Палікарповіча. Паселішчы С.к. размешчаны на берагах рэк на першых і другіх надпоймавых тэрасах, часта паблізу выхаду крамянёвай сыравіны. Асн. заняткамі насельніцтва былі паляванне, рыбалоўства і збіральніцтва. Адметная рыса помнікаў С.к. — шырокае выкарыстанне ў якасці загатовак для прылад працы адшчэпаў, часта з мелавой скарынкай. Адной з найб. выразных форм прылад з'яўляюцца наканечнікі стрэл з дакладна агранёных ножападобных пласцін. Сярод інш. прылад разцы, скрабкі, свярдзёлкі, праколкі, сякеркі з перахватам, авальныя, трапецападобныя, камбінаваныя і інш. прылады. На думку У.П.Ксяндзова, большасць помнікаў С.к. ўваходзіць у склад днепра-дзяснінскай культуры. На Беларусі вядома каля 14 помнікаў С.к. Найб. даследаваныя *Журавель*, *Новы Быхаў* і інш.

СО́ЙКА звычайная (Garrulus glandarius), птушка сям. крумкачовых атр. вераб'інападобных. Пашырана ў Еўропе, М. Азіі, часткова на Д. Усходзе і Цэнтр. Азіі. Насяляе пераважна мяшаныя і лісцевыя лясы, радзей хваёвыя. На Беларусі звычайны аселы і вандроўны від; трымаецца ў лясах з падлескам і маладняком.

Даўж. да 40 см, маса да 200 г. Апярэнне спіны і брушка рыжавата-карычневая; галава і горла шаравата-белыя, на галаве цёмныя падоўжаныя стракаціны; надхвосце белае, канцы крылаў і хвост чорныя; на крылах яркаблакітныя пёры з вузкімі, чорнымі палоскамі; па баках ад дзюбы чорныя «вусы». Корміцца жалудамі, арэхамі ляшчыны, ягадамі, таксама насякомымі. У кладцы 5—7 (зрэдку да 10) яец.



Сойка звычайная.



Сойм Рэчы Паспалітай. Гравюра з кнігі «Статут Вялікага княства Літоўскага». Вільня, 1619.

СОЙМ, с е й м, саслоўна-прадстаўнічы орган у ВКЛ у 15 — 1-й пал. 16 ст. і Рэчы Паспалітай у 2-й пал. 16—18 ст. Генезіс С. мае карані ў вечавых сходах (гл. *Вечa*). Дакладны час ператварэння нарад вял. князя ВКЛ з саноўнікамі ў пасяджэнні вальнага агульнадзярж. С. як прадстаўнічага органа ўсяго шляхецкага саслоўя спрэчны. Першапачаткова сістэмы прадстаўніцтва на С. не існавала. Манарх прымаў рашэнні і аб скліканні С., і аб яго складзе. На ім маглі вырашацца любыя пытанні, што прапаноўваліся гаспадаром або *Радай Вялікага княства Літоўскага*. Збіраліся і С. асобных зямель ВКЛ. Віленскі прывілей 1565 і Статут ВКЛ 1566 стварылі ін-т павятовых *соймікаў* і вызначылі сістэму прадстаўніцтва шляхты на С. — па 2 паслы (дэпутаты) ад павета. Баярства, якое не атрымала шляхецкіх правоў, духавенства, мяшчанства і сялянства не мелі свайго прадстаўніцтва на С. як асобныя станы. С. падзяляўся на 2 палаты: кола паноў-рады (Рада ВКЛ) і рыцарскае (шляхецкае) кола. Пасля *Люблінскай уніі 1569* супольны вальны С. Рэчы Паспалітай складаўся з *Сената* (вышэйшая палата) і Пасольскай Ізбы (ніжэйшая палата). Адразу пасля заключэння уніі ў складзе Пасольскай Ізбы было 170 паслоў, з якіх 48 прадстаўлялі ВКЛ. Колькасць паслоў павялічвалася шляхам стварэння новых соймікавых акруг. Да выключнай кампетэнцыі С. належалі: выданне заканадаўчых актаў, увядзенне падаткаў, скліканне *паспалітага рушэння*, выпрацоўка агульнага кірунку знешняй палітыкі, зацвярджэнне мірных дагавораў. К а н в а к а ц ы й н ы С. вызначаў месца і час выбараў манарха, выпрацоўваў умовы, якія ставіліся кандыдату на трон. Э л е к ц ы й н ы С. выбіраў манарха. На к а р а н а ц ы й н ы м С. манарх прысягаў выконваць умовы, паводле якіх адбылося яго выбранне. У адпаведнасці з «*Генрыкавымі артыкуламі*» манарх абавязваўся кожныя 2 гады склікаць 6-тыднёвы а р д ы н а р н ы (звычайны) С. Пры неабходнасці маглі склікацца э к с т р а а р д ы н а р н ы я (надзвычайныя) 2-тыднёвыя С. Каралю было пакінута права заканадаўчай ініцыятывы і санкцыянавання пастаноў С. Пасля Люблінскай уніі большасць С. адбывалася ў Варшаве, каранацыйныя — у Кракаве. Экстраардынарны С. 1653 прайшоў у Брэсце. На С. 1673 прынята пастанова, што кожны 3-і чарговы С. будзе адбывацца ў Гродне. Соймавыя пастановы (*канстытуцыі*) прымаліся кансэнсусам, іх падпісваў кароль, паслы і сенатары. З 1652 некаторыя С. заканчваліся без прыняцця пастаноў, зрываліся шляхам выкарыстання пасламі права *ліберум вета* (з 1669). У 1764—66 пастаноўлена менш важныя пытанні вырашаць большасцю галасоў.

Літ.: Л ю б а в с к и й М.К. Литовско-русский сейм: Опыт по истории учреждения в связи с внутренним строем и внешнею жизнью государства. М., 1900; М а к с и м е й к о Н.А. Сеймы Литовско-Русского государства до Люблинской унии 1569 г. Харьков, 1902; Historia sejmu Polskiego. T. 1. Warszawa, 1984; Dzieje sejmu Polskiego. 2 wyd. Warszawa, 1997.

А.А.Радаман.

СО́ЙМІК, с е й м і к, сход *шляхты* павета (зямлі, ваяводства) у ВКЛ у 16—18 ст., дзейнасць якога рэгламентавалася нормамі права; форма самарэалізацыі шляхецкай супольнасці павета і дзярж.-прававы ін-т, дзякуючы якому шляхецкая супольнасць была здольная прымаць рашэнні. Генетычна ўзыходзіць да *веча* і з'ездаў баяр-шляхты пэўнай зямлі. Віленскі прывілей 1565 і Статут ВКЛ 1566 стварылі павятовыя перадсоймавыя С., на якіх выбіраліся па 2 паслы ад павета на *сойм*, і э л е к ц ы й н ы я С., на якіх выбіраліся кандыдаты на пасады павятовага *земскага суда* і на павятовыя шляхецкія пасады (урады). П е р а д с о й м а в ы я С. збіраліся не пазней як за 4 (з 1588 за 6) тыдні да сойма, а працягласць — 3—4 дні. Пасля сойма, не пазней як праз 4 тыдні, збіраліся п а с о й м а в ы я (рэляцыйныя) С. У час міжкаралеўя збіраліся к а п т у р о в ы я С., якія стваралі канфедэратыўную ўладу і *каптуровы суд*. Д э п у т а ц к і я (трыбунальскія, грамнічныя) С. выбіралі суддзяў у склад *Трыбунала Вялікага княства Літоўскага*. Г а с п а д а р ч ы я С. прымалі ўхвалы па справах павета, размяркоўвалі падаткі, выбіралі паборцаў і камісараў у Трыбунал скарбовы ВКЛ. На падобных на С. попісавых з'ездах шляхты адбываліся шляхецкія *попісы войска Вялікага княства Літоўскага*.

Літ.: Л а п п о И.И. Великое княжество Литовское во второй половине XVI столетия: Литовско-русский повет и его сеймик. Юрьев, 1911; K r i e g s e i s e n W. Sejmiki Rzeczypospolitej szlacheckiej w XVII i XVIII w. Warszawa, 1991.

А.А.Радаман.

«СО́КАЛ», замак, што існаваў у 16 ст. непадалёк ад в. Сакалішча (Расонскі р-н Віцебскай вобл.). Пабудаваны ў пач. Лівонскай вайны 1558—83 паводле загаду рус. цара Івана IV Грознага як крэпасць на захопленых полацкіх землях. Паўавальны ў плане замак з 10 вежамі, якія ўнутры былі падзелены на 2—3 ярусы, мелі баявыя памяшканні і амбразуры. 4 вежы чацверыковыя, завершаныя 2-схільнымі дахамі, астатнія васьмерыковыя, з высокімі шатровымі дахамі. Вежы стаялі на высокіх насыпах і злучаліся аба-



Соймік. Малюнак Я.П.Норбліна.

рончымі сценамі. У сцяне, процілеглай закругленай частцы, размяшчаліся арачная брама пад 2-схільным дахам з 2 байніцамі абапал праезду. У цэнтры замкавага двара стаяла царква, якую абкружалі прамавугольныя ў плане хаты. Замак адлюстраваны на малюнку С.Пахалавіцкага (1579). Разбураны ў 1579 войскамі караля Рэчы Паспалітай Стафана Баторыя.



Замак **«Сокал»**. З малюнка С.Пахалавіцкага. 1579.

СО́КАЛ Віталь Аляксандравіч (н. 23.1.1940, Мінск), бел. вучоны ў галіне мікраэлектронікі. Д-р тэхн. н. (1989), праф. (1994). Скончыў Маскоўскі ін-т электронікі і аўтаматыкі (1969). З 1971 у Бел. ун-це інфарматыкі і радыёэлектронікі (з 1995 заг. кафедры). Навук. працы па электрахім. алюмааксіднай тэхналогіі гібрыдных інтэгральных мікрасхем і шматкрыштальных модуляў. Дзярж. прэмія Беларусі 1999.

Тв.: Закономерность формирования размеров ячеек пористого оксида алюминия // Докл. АН БССР. 1986. Т. 30, № 3; Электрохимическая алюмооксидная технология в микроэлектронике (разам з У.А.Лабуновым) // Техника средств связи. Сер. Технология производства и оборудование. 1988. Вып. 3.

СО́КАЛ Майсей Барысавіч (5.10.1904, г. Жмерынка Вінніцкай вобл., Украіна — 8.3.1975), бел. акцёр. Засл. арт. Беларусі (1938). Скончыў Маскоўскую тэатр. студыю «Культур-ліга» (1924). Працаваў у Харкаўскім, з 1927 у Дзярж. яўр. т-ры Беларусі, дзе паставіў спектакль «Тэўемалочнік» паводле Шолам-Алейхема (1939; выконваў і гал. ролю). З 1949 у Дзярж. рус. драм. т-ры Беларусі. Выканаўца драм. і характарных роляў. Створаныя ім вобразы вылучаліся псіхал. дакладнасцю і яркім вонкавым малюнкам. Сярод значных роляў: Блазан («Кароль Лір» У.Шэкспіра), Суддзя («Фуэнтэ Авехуна» Лопэ дэ Вэгі), Том («Хаціна дзядзькі Тома» паводле Г.Бічэр-Стоу), Сілан, Рабінзон («Гарачае сэрца», «Беспасажніца» А.Астроўскага), Шпрых («Маскарад» М.Лермантава), Якаў Трошын («Дзеці сонца» М.Горкага) і інш. *А.А.Савіцкая.*

СО́КАЛ Сцяпан Фёдаравіч (н. 8.10.1943, в. Шавялі Ляхавіцкага р-на Брэсцкай вобл.), бел. юрыст, гісторык, філосаф. Д-р юрыд. н. (1988), праф. (1990). Скончыў БДУ (1967). З 1967 пам. пракурора Чэрыкаўскага р-на. У 1971—74 і 1981—85 у Ін-це філасофіі і права АН Беларусі. У 1974—77 у Мінскім радыётэхн. ін-це, у 1977—81 інспектар Мін-ва вышэйшай адукацыі БССР; з 1985 у Гродзенскім ун-це (дэкан, заг. кафедры). З 1990 рэктар Бел. недзяржаўнага ін-та правазнаўства. Даследуе развіццё сацыялаг., паліт. і прававой думкі Беларусі.

Тв.: Социологическая и политическая мысль в Белоруссии во II половине XVI в. Мн., 1974; История юридической науки Беларуси. Мн., 2000 (разам з І.Юхо); Палітычная і прававая думка Беларусі XVI—XVIII стст. 2 выд. Мн., 2000 (разам з С.А.Падокшыным).

СОКАЛАПАДО́БНЫЯ, дзённыя драпежныя птушкі (Falconiformes), атрад птушак. 5 сям., 79 родаў, 290 відаў. *Паўвывадкавыя птушкі.* Пашыраны ўсюды, акрамя Антарктыды і невял. акіянічных астравоў. На Беларусі 22 віды, з якіх 14 у Чырв. кнізе: *арлан-белахвост*, *арол-карлік*, *беркут*, *дзербнік*, *змеяед*, *падворлікі* вялікі і малы, *пустальга*, *сапсан*, *скапа*, *сокал-каршачок*, *шулёнак*, або шулячок, каршун чырвоны (гл. *Каршуны*), мышалоў стэпавы (гл. *Мышаловы*). У Чырв. кнізе МСАП 16 відаў і 15 падвідаў. Вядуць пераважна дзённы спосаб жыцця (адсюль другая назва).

Даўж. цела 14—120 см, размах крылаў да 3 м, маса ад 35 г да 12 кг. Самкі звычайна буйнейшыя за самцоў. Апярэнне шчыльнае, шорсткае, бураватае ці шэрае са стракацінамі. Крылы вострыя і вузкія ў сокалаў і шырокія, тупыя ў ястрабаў. Дзюба моцная, вострая, кручкападобная, каля асновы пакрыта голай, гладкай скурай — васкавіцай. Ногі моцныя. Кіпцюры вострыя (у *грыфаў* тупыя), загнутыя. Манагамы. Драпежныя, часта ўсёедныя. У кладцы ў буйных відаў 1—2 яйцы, у дробных да 7. Гл. таксама *Арлы*, *Асаед звычайны*, *Канюкі*, *Крэчат*, *Перапёлачнік*, *Сіпы*.

СО́КАЛАЎ Генадзь Аляксандравіч (н. 20.1.1931, в. Казакі Віцебскага р-на), бел. вучоны ў галіне вет. медыцыны. Д-р вет. н. (1988), праф. (1989). Скончыў Віцебскі вет. ін-т (1961). З 1967 у Віцебскай акадэміі вет. медыцыны (з 1974 заг. кафедры). Навук. працы па праблемах зоагігіенічнай профілактыкі інвазійных захворванняў с.-г. жывёл (эймерыёзу авечак), аэрастазных хвароб жывёл, вызначэння заган мікраклімату памяшканняў.

Тв.: Ультрафиолетовое облучение в животноводстве. Мн., 1978 (разам з С.С.Абрамавым); Профилактика эймериозов сельскохозяйственных животных. Мн., 1986; Ветеринарная гигиена. Мн., 1998.

СО́КАЛАЎ-ВО́ЮШ Сяржук (сапр. Сокалаў Сяргей Анатолевіч; н. 16.10.1957, в. Астроўшчына Полацкага р-на Віцебскай вобл.), бел. паэт і бард. Скончыў БДУ (1985). Настаўнічаў, працаваў на з-дзе, навук. супрацоўнікам філіяла Літ. музея Я.Коласа ў в. Мікалаеўшчына Стаўбцоўскага р-на (1984—85), заг. літ. часткі лялечнай трупы Бел. т-ра імя Я.Коласа (1988—90). З 1991 за мяжою. Друкуецца з 1973. У кн. «Кроў на сумётах» (1989) публіцыст. і грамадзянская лірыка. Піша музыку да сваіх вершаў. Аўтар казкі «Свецяць, свецяць зорачкі...» (паст. 1989). На бел. мову пераклаў п'есы Л.Андрэева «Манумент», «Любоў да бліжняга», вершы рус., укр., польскіх паэтаў. *Г.В.Кажамякін.*

СО́КАЛ-КАРШАЧО́К, каршачок (Falco subbuteo), драпежная птушка



Сокал-каршачок.

сям. сакаліных атр. сокалападобных. Пашыраны на Пн Еўразіі і ў Паўн. Афрыцы (акрамя тундраў і пустынь), насяляе лясы і лесастэпы. Гняздуецца на высокіх дрэвах. Зімуе на Пд Азіі і Афрыкі. На Беларусі нешматлікі пералётны від. Нар. назвы аралок, карагольчык, кабец. Занесены ў Чырв. кнігу.

Даўж. да 36 см, маса да 280 г. Самкі буйнейшыя за самцоў. Апярэнне спіны бураватачорнае з шызым адценнем, грудзей і брушка — светла-вохрыстае з буйнымі цёмнымі стракацінамі, падхвосця і галёнак — рыжае; па баках ад дзюбы чорныя палосы — «вусы». Кольца вакол вока і ногі жоўтыя. Корміцца насякомымі, дробнымі птушкамі, лятучымі мышамі. Адкладвае да 4, зрэдку да 6 яец. *Э.Р.Самусенка.*

СО́КАЛ-САПСА́Н, птушка сям. сакаліных; гл. *Сапсан.*

СО́КАРАВА, вёска ў Бешанковіцкім р-не Віцебскай вобл., на паўд. беразе воз. Паўазер'е, на аўтадарозе Ула—Лепель. Цэнтр сельсавета і раённага камунальнага унітарнага вытв. (с.-г.) прадпрыемства. За 32 км на Пн3 ад г.п. Бешанковічы, 82 км ад Віцебска, 33 км ад чыг. ст. Чашнікі. 416 ж., 177 двароў (2001). Клуб, б-ка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў.

СО́ЛА (італьян. solo ад лац. solus адзін, адзіны), 1) самастойная партыя аднаго выканаўцы (саліста) або эпізод у оперы, балеце, вак.-сімф., сімф., харавым ці кам.-інстр. творы, разлічаны на выкананне адным спеваком, танцорам ці інструменталістам. 2) Муз. твор ці яго частка, прызначаны для аднаго голасу або інструмента (з акампанементам ці без яго). 3) Tasto solo (T.S.; італьян. ад-

на клавіша), абазначэнне ў генерал-басе, якое ўказвае на неабходнасць выканання партыі баса без акордавых гукаў. У партытуры тэрмін «С.» пазначае момант уступлення саліста, на тытульным лісце твора — яго прызначэнне для аднаго інструмента. Як аднагалосая форма выканання С. ўласціва і нар., у т.л. бел., песеннаму і інстр. муз. мастацтву.

Т.Б.Варфаламеева.

СО́ЛА (Solo), другая назва г. *Суракарта* ў Інданезіі.

СО́ЛАД, брадзільны прадукт, падрыхтаваны з прарошчанага, высушанага і змолатага зерня збажыны (ячменю, жыта, пшаніцы, аўса). Выкарыстоўваецца для вырабу спірту, піва, квасу, дражджэй і інш.

СО́ЛАДАВЫ ЦУ́КАР, тое, што *мальтоза*.

СО́ЛАДЗІ, глебы, што ўтвараюцца пераважна з *саланцоў* пры іх пераўвільгатненні і рассаленні. Фарміруюцца ва ўмовах перыяд. прамыўнога рэжыму, які вядзе да разбурэння калоідаў верхняга гарызонту, памяншэння колькасці ў іх 2—3-валентных металаў (пераважна жалеза і марганцу) і павелічэння крэменязёму (працэс асалоджвання). Характарызуюцца развіццём элювіяльнага асаладзелага гарызонту на глыб. 5—20 см, слабакіслай рэакцыяй гумусавага гарызонту (мае 2—8% гумусу), глыбокім пранікненнем гумусу па профілі, *агляненнем глебы*. Сустракаюцца плямамі ў Зах. Сібіры, Паўн. і Цэнтр. Казахстане, ЗША, Аўстраліі. Выкарыстоўваюць пад сенажаці.

СО́ЛАН, рака ў Старадарожскім р-не Мінскай вобл., левы прыток р. Арэса (бас. р. Прыпяць). Даўж. 32 км. Пл. вадазбору 278 км^2. У верхнім цячэнні наз. Казённая канава. Пачынаецца за 4 км на ПнЗ ад в. Зялёная Дуброва, вусце за 1,6 км на ПнУ ад в. Баравікі. Цячэ па паўд.-зах. ч. Цэнтральнабярэзінскай раўніны. Даліна на вял. працягу невыразная, у сярэднім цячэнні, каля в. Солан, трапецападобная. Пойма ў верхнім цячэнні адсутнічае, у сярэднім і ніжнім цячэнні двухбаковая, шыр. 200—500 м. Рэчышча ад вытоку на працягу 19,6 м каналізаванае, астатняе звілістае, шыр. 5—10 м.

СО́ЛАПАЎ Міхаіл Рыгоравіч (н. 15.10.1924, с. Пакроўскае Цярбунскага р-на Ліпецкай вобл., Расія), бел. баяніст, педагог, дзеяч самадз. мастацтва. Засл. дз. культуры Беларусі (1963). Засл. дз. маст. Беларусі (1992). Праф. (1993). Скончыў Маскоўскі муз.-пед. ін-т імя Гнесіных (1955). З 1948 у Брэсце, выкладчык муз. навуч. устаноў, арганізатар калектываў маст. самадзейнасці, у т.л. сімф. аркестра пры муз. вучылішчы (1950—67), хору настаўнікаў (кіраўнік у 1961—63) і інш.; у 1967—70 дырэктар Раснянскай дзіцячай муз. школы Камянецкага р-на. З 1966 у Бел. акадэміі музыкі (у 1973—79 заг. кафедры). Аўтар апрацовак і інструментовак для аркестраў і ансамбляў розных складаў, сольных п'ес, песень, рамансаў. Склаў вучэбна-пед. рэпертуар для баяна, акардэона, фп., цымбалаў, у т.л. «Падручнік для класа цымбал» (1977), праграмы па класе баяна для муз. каледжа пры Бел. акадэміі музыкі і па ўводзінах у спецыяльнасць для муз. вучылішчаў. Даследуе праблемы прафес. выканальніцкага мастацтва і маст. самадзейнасці. Складальнік кн. «І.І.Жыновіч ва ўспамінах сучаснікаў» (1997).

А.В.Скорабагатчанка.

СОЛЕВЫНО́СЛІВАСЦЬ РАСЛІ́Н, солеўстойлівасць раслін, здольнасць раслін расці на засоленых глебах (у якіх солей больш за 0,2% ад масы глебы). У гэтых умовах на расліны ўплываюць негатыўныя фактары (павялічаны асматычны ціск, таксічныя солі, недахоп элементаў каранёвага жыўлення), якія парушаюць абмен рэчываў і стан палімераў пратаплазмы. Большасць раслін несолевынослівыя (глікафіты). Найб. солеўстойлівыя *галафіты*: соленазапашвальныя (салянкі), солевыдзяляльныя (кермек, мангравыя расліны), з нізкім паглынаннем солі (палыны). С.р. абумоўлена генетычна, але змяняецца ў выніку адаптацый. Пры хларыдным засаленні расліны становяцца больш мясістымі — *сукулентамі*, пры сульфатным — *ксерафітамі*. Сярод культ. раслін на моцназасоленых глебах растуць цукр. буракі, яблыня, міндаль, спаржа. Да сярэдняга засалення ўстойлівыя сланечнік, ячмень, бавоўнік, памідоры, гарбуз. С.р. мінімальная на фазе праросткаў і ўтварэння генератыўных органаў.

СО́ЛІ, клас хім. злучэнняў; крышт. рэчывы з іоннай структурай (гл. *Іонная сувязь*). З'яўляюцца прадуктамі поўнага ці частковага замяшчэння іонаў вадароду ў малекулах кіслот на катыёны (іоны металаў, амоній і інш.) або гідраксільных (OH) груп у малекулах асноў на аніёны кіслотных астаткаў (напр., хларыд-, сульфат-аніён).

Падзяляюць на сярэднія, ці нармальныя, — прадукты поўнага замяшчэння (напр., Na_2SO_4), кіслыя (гідрасолі; напр. $NaHCO_3$) і асноўныя (гідраксасолі; напр., MgClOH) — прадукты няпоўнага замяшчэння адпаведна іонаў вадароду многаасноўных кіслот і OH груп многакіслотных асноў. Адрозніваюць таксама С. простыя, якія маюць катыёны і аніёны аднаго віду (напр., $MgCl_2$), двайныя [маюць катыёны 2 відаў, напр., $KAl(SO_4)_2 \cdot 12H_2O$], мяшаныя (з рознымі аніёнамі, напр., CaClOCl) і комплексныя (гл. *Комплексныя злучэнні*). Прадукты ўзаемадзеяння асноў і кіслот Льюіса (гл. *Кіслоты*) адрозніваюцца ад звычайных солей, таму іх наз. кіслотна-асноўнымі комплексамі ці адуктамі. Многія С. добра растваральныя ў вадзе (напр., *нітраты*, *хларыды*). У водных растворах цалкам ці часткова дысацыіруюць на іоны (гл. *Электралітычная дысацыяцыя*), а С. слабых кіслот і(ці) слабых асноў гідралізуюцца (гл. *Гідроліз* солей). Атрымліваюць С. ўзаемадзеяннем кіслот з асновамі (рэакцыя нейтралізацыі) і асноўнымі аксідамі, кіслотных аксідаў з асновамі і асноўнымі аксідамі, металаў з моцнымі к-тамі і інш. метадамі. Выкарыстоўваюць у прам-сці (хім., металургічнай, харч., тэкст. і інш.), сельскай гаспадарцы, медыцыне. Гл. таксама *Галагеніды*, *Карбанаты*, *Сульфаты*, *Фасфаты*.

А.П.Чарнякова.

СО́ЛІД (лац. solidus трывалы, паўнацэнны), залатая, білонная ці медная манеты еўрап. дзяржаў. 1) Залатая манета Візант. імперыі 8—13 ст. (маса 4—4,40 г). На Беларусі абарачалася пад наз. *намісма*. 2) Білонная манета 15—16 ст. г. Гданьска, Торуня і Эльбланга (маса адпаведна 1,38 г, 1,44 г і 1,40 г, 1,24 г). 3) Білонная і медная манеты 17—18 ст. Рэчы Паспалітай, парытэтныя 1/3 *гроша*. У білонных С. з 1580 маса 1,12 г, з 1652 — 0,53 г, з 1670 — 0,71 г. У медных С. у 1650 маса 2,62 г, з 1659 — 1,41 г, з 1749 — 1,23 г, з 1766 — 1,30 г. Польскія эмісіі С. выпускалі на манетных дварах у Быдгашчы, Варшаве, Губіне, Дрэздэне, Кракаве, Мальбарку, Познані, Уяздзе. Літоўскія эмісіі ВКЛ С. выпускалі: *Брэсцкі манетны двор* у 1665—66, *Віленскі манетны двор* у 1580—85, 1589—92, 1612—27, 1652—54, а таксама манетныя двары ў г. Коўна ў 1665—66, Мальбарку ў 1666, Олькушы ў 1663, 1665—66, Уяздзе ў 1660—61, 1665—66.



Солід: 1 — літоўская чаканка 1583; 2—3 — польская чаканка 1582, 1584; 4 — рыжская чаканка 1585.

Літ.: Рябцевич В.Н. Нумизматика Беларуси. Мн., 1995.

СО́ЛСБЕРЫ (Salisbury), назва да 1982 сталіцы Зімбабве г. *Харарэ*.

СО́ЛСБЕРЫ (Salisbury) Роберт Артур Толбат Гаскайн-Сесіл (Gascoyne-Cecil; 3.2.1830, г. Хатфілд, Вялікабрытанія — 22.8.1903), брытанскі дзярж. дзеяч. Лорд (з 1861). Скончыў Оксфардскі ун-т (1849). З 1853 дэп. палаты аб-

шчын ад партыі кансерватараў, з 1861 — палаты лордаў. У 1866—67 і 1874—78 міністр па справах Індыі, у 1878—80 міністр замежных спраў. Удзельнічаў у *Берлінскім кангрэсе 1878.* З 1881 лідэр Кансерватыўнай партыі. У 1885—86, 1886—92, 1895—1902 прэм'ер-міністр, адначасова (да 1900) міністр замежных спраў. Праводзіў актыўную знешнюю палітыку па пашырэнні тэрыторыі і ўплыву Брыт. імперыі ў Азіі (захоп Верхняй Бірмы ў 1886) і Афрыцы, у выніку якой абвастрыліся англа-франц. адносіны і пачалася *англа-бурская вайна 1899—1902.* У 1902 урад С. заключыў саюзны дагавор з Японіяй. Садзейнічаў узмацненню брыт. арміі і флоту. Выступаў супраць прадастаўлення аўтаноміі Ірландыі.



У.Я.**Солтан**.

СО́ЛТАН Станіслаў (1746 або 27.8.1756—1836), дзяржаўны і ваенны дзеяч ВКЛ. З роду *Солтанаў.* Ген.-ад'ютант польнай булавы ВКЛ, харунжы ВКЛ з 1782, падкаморы ВКЛ з 1790, маршалак надворны ВКЛ з 1791, староста слонімскі. Актыўны ўдзельнік падрыхтоўкі *паўстання 1794.* Пасля яго задушэння сасланы ў Казань. Вызвалены Паўлам I. У 1806—07 разам з палк. Ф.Патоцкім рыхтаваў новае паўстанне ў б. ВКЛ. Загадам Напалеона 1.7.1812 прызначаны старшынёй *Часовага ўрада Вялікага княства Літоўскага*, адначасова ўзначальваў к-т харчавання і магазінаў. Пасля вайны 1812 у эміграцыі.

А.А.Ерашэвіч.

СО́ЛТАН Уладзімір Яўгенавіч (9.1.1953, г. Баранавічы Брэсцкай вобл. — 1.6.1997), бел. кампазітар. Скончыў Бел. кансерваторыю (1979, кл. А.*Багатырова*). З 1983 выкладчык Бел. акадэміі музыкі. Творчасць адметная жанравай разнастайнасцю, інтанацыйнай выразнасцю, эмацыянальнай напружанасцю, нац. акрэсленасцю. Асн. дасягненні ў жанры оперы і віяланчэльнай музыкі. Сярод твораў: оперы «Дзікае паляванне караля Стаха» (паводле аповесці У.Караткевіча, паст. 1989), «Пані Ядвіга» (паводле аповесці К.Тарасава «Чорны шлях», 1990), «Мілавіца» (паст. 1994); 2 сімфоніі (1981, 1983), 2 канцэрты для віяланчэлі з арк. (1987, 1997); для камернага арк.: сюіта «Думкі і настроі» (1978), канцэрт (1983), лірычная кантата «Мая Беларусь» на тэксты нар. і бел. паэтаў (1981); камерна-інстр. творы, у т.л. стр. квартэт, фп. трыо, саната для фп., элегія для віяланчэлі; вак. цыклы на вершы М.Багдановіча, А.Таркоўскага, хары на вершы Я.Купалы, Ф.Цютчава; песні, музыка да кінафільмаў. Дзярж. прэмія Беларусі 1990.

Літ.: Галушко М. Национальный сюжет — современное прочтение // Сов. музыка. 1990. № 4.

Р.М.Аладава.

СО́ЛТАНЫ, Перасвет-Солтаны, шляхецкі род уласнага герба ў ВКЛ. Родапачынальнік Аляксандр (Солтан) — падскарбі земскі ў 1443—54, шмат падарожнічаў па Еўропе, быў пры дварах герм. імператара, неапалітанскага, партугальскага і англ. каралёў, міланскага і бургундскага герцагаў. Найб. вядомыя:

Андрушка Аляксандравіч (? — да 21.6.1498), сын Аляксандра (Солтана), падскарбі дворны ў 1486 і земскі з 1486. Івахна Андрэевіч (?—1554), сын Андрушкі Аляксандравіча, падскарбі дворны ў 1505—54, намеснік мейшагалаўскі і дубянецкі ў 1507—08, вялёнскі з 1609. Івашка (Солтан) Аляксандравіч (?—1495), сын Аляксандра (Солтана), падскарбі земскі ў 1473—86 і дворны з 1476, маршалак гаспадарскі ў 1482—93, слонімскі намеснік у 1486—87 і гарадзенскі ў 1486, намеснік новагародскі ў 1486—87, староста бельскі з 1493. Аляксандр Солтанавіч (? — каля 1554), сын Івашкі (Солтана) Аляксандравіча, маршалак дворны ў 1514—54. Іван Аляксандравіч (пасля 1520 — да 20.9.1577), сын Аляксандра Солтанавіча, дзяржаўца астрынскі з 1566, маршалак дворны з 1572. Станіслаў (1746 або 27.8.1756—1836), гл. *Солтан* С.

Існаваў іншы род С. (Салтанавічаў), з якога паходзіў мітрапаліт кіеўскі, галіцкі і ўсяе Русі Іосіф II (1506—1521 або 1522).

У.М.Вяроўкін-Шэлюта.

СОЛТ-ЛЕЙК-СІ́ЦІ (Salt Lake City), горад на З ЗША, на р. Джордан, каля яе ўпадзення ў Вял. Салёнае возера. Адм. ц. штата Юта. Засн. ў 1847. 174,3 тыс. ж., з г. Огдэн і агульнымі прыгарадамі больш за 1 млн. ж. (1998). Вузел чыгунак і аўтадарог на транскантынентальных шляхах. Міжнар. аэрапорт. Прамысл. і гандл.-фін. цэнтр Горных штатаў, цэнтр горназдабыўной прам-сці і каляровай металургіі (выплаўка медзі), адзін з найважн. цэнтраў ваен. ракетабудавання ў ЗША. Прам-сць: радыёэлектронная, у т.л. вытв-сць ЭВМ, сродкаў сувязі і інш. абсталявання пераважна на ваен. мэты; вытв-сць кантрольна-вымяральных прылад, авіяц. і аўтамаб. дэталей і вузлоў, мед. інструменту, абсталявання для горназдабыўной і металург. прам-сці; металаапр., хім., нафтаперапр., харч., паліграфічная. Рэлігійны цэнтр *мармонаў.* Ун-т. Музеі. Месца правядзення XIX зімовых Алімпійскіх гульняў (2002).

СО́ЛТЫС, 1) у феадальнай Польшчы і ў Рэчы Паспалітай намеснік феадала ў вёсцы або мястэчку. Збіраў з насельніцтва падаткі, наглядаў за выкананнем феад. павіннасцей, старшынстваваў у судзе, камандаваў апалчэннем у час ваен. паходу. 2) У міжваеннай Польшчы, у т.л. ў Зах. Беларусі (1920—39), — сельскі староста.

СО́ЛФАРД (Salford), горад на З Вялікабрытаніі, у канурбацыі Вял. *Манчэстэр*, на суднаходным Манчэстэрскім канале. Каля 250 тыс. ж. (2000). У С. асн. прычалы Манчэстэрскага порта. Прам-сць: маш.-буд., у т.л. тэкст., эл.-тэхн. і інш.; швейная, тэкст., хім., харчовая, у т.л. піваварная. Ун-т.

СО́ЛЫ, вёска ў Смаргонскім р-не Гродзенскай вобл., на р. Ашмянка; чыг. ст. на лініі Маладзечна—Гудагай. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 16 км на З ад г. Смаргонь, 237 км ад Гродна. 1525 ж., 594 двары (2001). Агароднінасушыльны з-д, рыбгас, Смаргонская птушкафабрыка. Сярэдняя школа, кінатэатр, б-ка, бальніца, амбулаторыя, аптэка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Царква. Брацкія магілы сав. воінаў, сав. ваеннапалонных. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Помнік архітэктуры — касцёл Маці Божай Ружанцовай (1926—34).

У сярэдзіне 16 ст. сяло Віленскага ваяв. ВКЛ, шляхецкая ўласнасць. Пасля 3-га падзелу Рэчы Паспалітай (1795) у Рас. імперыі, мястэчка, цэнтр воласці Ашмянскага пав. Віленскай губ. У 1849 у С. пабудаваны касцёл, з 1870 працавала нар. вучылішча. У 1886 у С. 560 ж., валасное праўленне, касцёл, сінагога, 5 крам, карчма, вінакурны з-д (4 км ад С.). У 1890 пошта, тэлеграф, станцыя Лібава-Роменскай чыг. (1873). У пач. 20 ст. ў мястэчку 880 ж., працаваў урачэбны ўчастак, на ст. С. 70 ж. 4.12.1917 у С. быў падпісаны першы дагавор аб перамір'і паміж прадстаўнікамі армій Зах. фронту Сав. Расіі і камандаваннем герм. армій Усх. фронту. З 1921 С. ў складзе Польшчы, цэнтр гміны Ашмянскага пав. Віленскага ваяв. З 1939 у БССР, вёска. З 1940 цэнтр сельсавета Смаргонскага р-на Віленскай вобл. У Вял. Айч. вайну ням. фашысты загубілі ў С. 28 сав. ваеннапалонных. З 1944 у Маладзечанскай, з 1960 у Гродзенскай абл.

Г.І.Дулеба.

СО́ЛЬНАК (Szolnok), горад у цэнтр. Венгрыі. Адм. ц. аднайм. медзьё. Засн. ў 1075. Каля 100 тыс. ж. з прыгарадамі (2000). Вузел чыгунак і аўтадарог, порт на р. Ціса. Прам-сць: хім., с.-г. і эл.-тэхн. машынабудаванне, цэлюлозна-папяровая, харч., харчасмакавая, дрэваапр., швейная, мэблевая. Музей. Тэатр. Арх. помнікі 18—19 ст. У раёне С. — здабыча нафты і газу.

СО́ЛЬСКІ (Solski) Людвік [сапр. Сасноўскі (Sosnowski) Людвік Напалеон Кароль; 20.1.1855, в. Гдоў Малапольскага ваяводства, Польшча — 19.1.1954], польскі акцёр, рэжысёр і тэатр. дзеяч. З 1876 акцёр, рэжысёр, кіраўнік розных т-раў Кракава (1883—1900, 1905—13), Львова (1900—05), Варшавы (1924—39) і інш. гарадоў. Прадстаўнік рэаліст. традыцый польскай сцэны, майстар пераўвасаблення. Сярод роляў: ксёндз Пётр («Дзяды» А.Міцкевіча), Міцкевіч («Легіён» С.Выспянскага), Латка («Па-

жыццёвая рэнта» А.Фрэдры), Петручыо («Утаймаванне свавольніцы» У.Шэкспіра), Гарпагон («Скупы» Мальера), Фірс («Вішнёвы сад» А.Чэхава), Акцёр («На дне» М.Горкага), Грозны («Смерць Іаана Грознага» А.Талстога) і інш.

Тв.: Рус. пер. — Воспоминания. М., 1961.

СОМ звычайны (Silurus glanis), рыба сям. сомавых атр. карпападобных. Пашыраны ў Еўропе на У ад р. Рэйн (акрамя бас. Паўн. Ледавітага ак. і Балканскага п-ва) і ў Азіі ў бас. Аральскага м., р. Амур. Аселы, жыве ў глыбокіх месцах. На Беларусі рэдкі.

Даўж. да 5 м, маса да 300 кг. Цела вераценападобнае, без лускі. Спіна чорная, бакі жоўта-зялёныя, бруха амаль белае. Скура мяккая, слізкая. Галава вял., пляскатая. Рот шырокі, ніжняя сківіца даўжэйшая за верхнюю. На верхняй сківіцы пара доўгіх вусікаў, на ніжняй — 2 пары кароткіх. Вочы невялікія. Анальны плаўнік доўгі, зліваецца з закругленым хваставым. Драпежнік. Аб'ект промыслу. *А.М.Петрыкаў.*



Сом звычайны.

СОМ Лера (Алена Уладзіміраўна; н. 12.8.1966, г. Полацк Віцебскай вобл.), бел. паэтэса і бард. Скончыла Віцебскі пед. ін-т (1989), БДУ (1999). Настаўнічае. Друкуецца з 1987. Піша на бел. і рус. мовах. Першая кніга паэзіі — «Блюз каралеўскае кухні» (1994). У паэт. зб-ках «Адзінокая зорка» (1996) і «Там, на небе» (2000) філас. асэнсаванне жыцця і смерці, тэмы паэта і паэзіі, кахання. Аўтар цыкла фантастычных апавяданняў «Некалькі гісторый з жыцця Руніты Магі» (1993), фантастычнай аповесці «Суполка Вогнішча» (2001), літ.-крытычных і публіцыстычных артыкулаў. *А.В.Спрынчан.*

СО́МА, у старажытнаіндыйскай міфалогіі «боскі» (верагодна, галюцынагенны) напітак і бажаство гэтага напітку (пазней і бажаство Месяца) — Сома Павамана («які ачышчаецца»). С. — валадар свету і неба, бог над усімі багамі, першатворца ўсяго існага. Ён прымушае ззяць Сонца, забяспечвае заканасць, дае багацце, шчасце, жыццёвую сілу, ежу, надзяляе майстэрствам спевакоў і г.д.

СО́МА (ад грэч. sōma цела), сукупнасць клетак мнагаклетачнага арганізма, акрамя палавых. У эўкарыятычных мікраарганізмаў аналаг саматычных клетак — вегетатыўныя клеткі. Тэрмін «саматычны» выкарыстоўваецца для абазначэння з'яў цялесных у адрозненне ад псіхічных, у генетыцы — клетак цела, у анатоміі — структур цела (мышцы, нерв. сістэма і інш.).

СО́МАВА Святлана Аляксандраўна (30.4.1911, С.-Пецярбург — 17.9.1989), руская паэтэса. Вучылася ў Літ. ін-це імя М.Горкага ў Маскве (1956—58). Друкавалася з 1928. Аўтар зб-каў «Ташкент» (1944), «Вершы і пераклады» (1947), «На палях Мірзачуля» (1950), «Сімург» (з Зульфіёй, 1951), «Агні Сталінграда» (1953), «Чырвоныя гваздзікі» (1961), «Агонь у акне» (1966), «Чырвоны явар» (1974), «На ўсходзе Месяца. Вершы і паэма» (1984). Яе творы вызначаюцца жыццёвай праўдзівасцю, эмацыянальнасцю. Была знаёма і перапісвалася з Я.Коласам. Пераклала на рус. мову шматлікія яго вершы, а таксама Э.Агняцвет. *М.І.Пратасевіч.*

СОМАПАДО́БНЫЯ (Siluriformes), атрад касцістых рыб. Каля 30 сям., 150 родаў, 1200 відаў. Пашыраны пераважна ў тропіках і субтропіках. Вядомы з эацэну. Жывуць у прэсных водах. На Беларусі 3 віды: звычайны сом (Silurus glanis), *сомік амерыканскі*, або карлікавы, завезены ў 1935 у вадаёмы Брэсцкай вобл. і паўночнаамерыканскі канальны, або плямісты сомік (Ictalurus punctatus), акліматызаваны ў воз. Белае Бярозаўскага р-на Брэсцкай вобл.

Даўж. да 5 м, маса да 300 кг (звычайны сом). Цела без лускі або ўкрытае касцявымі пласцінкамі. Вакол рота звычайна некалькі пар вусікаў. Ёсць *вебераў апарат*. 2, 3, 4 пазванкі зрослыя. На сківіцах зубы. Брушныя плаўнікі абдамінальныя. Амаль усе С. — драпежнікі. Многія — аб'екты промыслу, некат. разводзяць у акварыумах.

СО́МАЎ Канстанцін Андрэевіч (30.11.1869, С.-Пецярбург — 6.5.1939), расійскі жывапісец і графік. Правадз. чл. Пецярбургскай АМ (1913). Вучыўся ў Пецярбургскай АМ (1888—97) і ў акадэміі Каларосі ў Парыжы (1897). Адзін з заснавальнікаў час. «*Мир искусства*», чл. аднайм. маст. аб'яднання (гл. «*Свет мастацтва*»). З 1918 праф. Петраградскіх дзярж. свабодных маст. вучэбных майстэрняў. У 1923 выехаў з Расіі, з 1925 жыў у Парыжы. У многім вызначыў з'яўленне неарамант. рэтраспектыўнага жанру, уласцівага «Свету мастацтва», прасякнутага рэфлексіяй і іроніяй, заснаванага на стылізацыі і гратэску. Асн. сюжэты твораў — дваранскі побыт 18 — пач. 19 ст., матывы італьян. камедыі дэль артэ, эратычныя, якім уласцівы карнавальна-гульнёвы лад, ірэальнасць, прасякнутая сонечным пейзажным навакольлем: «Прагулка пасля дажджу» (1896), «Вечар» (1902), «Абсмеяны пацалунак» (1908), «Маладая жанчына спіць» (1909). У партрэтных работах дакладнасць характарыстыкі нярэдка спалучаецца з тыповай для мадэрна ідэяй партрэта-маскі: «Дама ў блакітным» (1897—1900), «А.Блок» (1907). У цэлым жывапіс С. вылучаецца акцэнтоўкай пэўных колеравых тонаў пры захаванні лакальнасці каларыту, лінеарнасцю і плоскаснасцю, дэкаратыўна-арнаментальным вырашэннем кампазіцыі, графіка — рафінаванай адточанасцю.

Літ.: К.А.Сомов: Письма. Дневники. Суждения современников. М., 1979; Журавлева Е.В. К.А.Сомов. М., 1980.

СО́МАЎ Міхаіл Міхайлавіч (7.4.1908, Масква — 30.12.1973), расійскі акіянолаг, палярны даследчык. Д-р геагр. н. (1954). Герой Сав. Саюза (1951). Скончыў Маскоўскі гідраметэаралагічны ін-т



К.**Сомаў**. Дама ў блакітным. 1897—1900.

(1937). З 1939 у Арктычным і Антарктычным н.-д. ін-це. У 1950—51 кіраваў дрэйфуючай ст. «Паўночны полюс-2», у 1955—57 — 1-й сав. антарктычнай экспедыцыяй, у 1962—64 — 8-й і 9-й, адкрыў 3 бухты, паўвостраў і возера, даследаваў 2 шэльфавыя ледавікі. Навук. працы па лядовым рэжыме палярных мораў, лядовых прагнозах. Яго імем названы ледавік у горным масіве Вольтат (Усх. Антарктыда).

СО́МБАТХЕЙ (Szombathely), горад на З Венгрыі. Адм. ц. медзьё Ваш. Узнік на месцы стараж.-рым. г. Саварыя, засн. ў 1 ст. Каля 100 тыс. ж. (2000). Вузел чыгунак і аўтадарог. Прам-сць: тэкст., маш.-буд., харч., гарбарна-абутковая, швейная, дрэваапрацоўчая. Музей «Саварыя» (стараж.-рым. і народнае мастацтва, карцінная галерэя). Бальнеалагічны курорт. Рэшткі ант. храма канца 2 — пач. 3 ст., арх. помнікі 18 ст. ў стылі барока, у т.л. палац біскупа і сабор.

СО́МЕРСЕТ (Somerset), востраў Канадскага Арктычнага архіпелага, на Пд ад праліва Бараў, тэр. Канады. Пл. 23,4 тыс. км^2. Выш. да 762 м. Нас. пункт — Форт-Рос.

СО́МІК АМЕРЫКА́НСКІ, сомік карлікавы (Ictalurus, або Amiurus nebulosus), рыба сям. кошак-самоў, або кашэчых самоў атр. сомападобных. Пашыраны ў вадаёмах Паўн. Амерыкі. Завезены ў 1885 у Зах. Еўропу, у 1935 у зах. вобласці Беларусі і Украіны. Рассяліўся пераважна ў вадаёмах Брэсцкай вобл. Жыве ў азёрах, рэках, сажалках, у т.л.забалочаных.

Даўж. 14—20 да 45 см, маса ад 45—100 г да 2 кг. Цела голае, крыху сціснутае з бакоў, ад жаўтаватага да цёмна-карычневага і чорнага колеру. Бруха светлае, белаватае, зрэдку плямістае. Ёсць альбіносы. Галава вял., шырокая. На сківіцах па 2 пары вусікаў. Неразгалінаваныя прамяні ў спінным, грудным і анальным плаўніках калючыя; ёсць тлушчавы



Сомік амерыканскі.

плаўнік. Корміцца лічынкамі насякомых, дробнымі малюскамі, водарасцямі, маляўкамі, ікрой інш. рыб.

СО́МІНСКАЕ ВО́ЗЕРА. У Іванцэвіцкім р-не Брэсцкай вобл., у бас. *Агінскага канала*, за 44 км на ПдУ ад г.Іванцэвічы. Пл. 0,41 км^2, даўж. 900 м, найб. шыр. 650 м, найб. глыб. 33,5 м, даўж. берагавой лініі 2,5 км. Катлавіна карставага тыпу. Схілы выш. да 2 м, пад хмызняком, на ПнЗ разараныя. Берагі нізкія, забалочаныя, пад хмызняком. Дно да глыб. 10 м. выслана пяском, ніжэй сапрапелем. Зарастае расліннасцю да глыб. 4 м.

СОН, фізіялагічны стан мозга і ўсяго арганізма чалавека і жывёл, які характарызуецца значным зніжэннем рухомасці, амаль поўнай адсутнасцю рэакцый на знешнія раздражняльнікі і адначасова асобнай арганізацыяй актыўнасці нейронаў галаўнога мозга. Надыходзіць перыядычна ў адпаведнасці з біярытмам «С. — няспанне».

Стан С. мае 2 фазы. Для яго п а в о л ь н а й ф а з ы характэрны павольныя ваганні эл. патэнцыялу, паніжэнне тонусу шкілетных мышцаў, адсутнічаюць рухі вачэй (або маюць маятнікападобны характар). Ф а з а х у т к а г а С. надыходзіць звычайна пасля павольнай і на электраэнцэфалаграме характарызуецца нізкаамплітуднай, пачашчанай рытмікай, падобнай на карцінку няспання або дрымоты. Суправаджаецца прыгнечанасцю спіннамазгавых рэфлексаў, павелічэннем мазгавога крывацоку і інш. (танічныя зрухі), хуткімі рухамі вачэй, падрыгваннем канечнасцей, вушэй, вібрысаў, асобнымі разрадамі ў мозгу і інш. (фіз. зрухі). Пры абуджэнні пасля хуткага С. чалавек часта паведамляе пра снабачанні. У нованароджаных пераважае хуткі С., у людзей 15—20 гадоў ён доўжыцца 20% ад агульнага часу С., у старасці працягласць хуткага С. памяншаецца. Паслядоўнасць фазы павольнага і хуткага С. ўтвараюць цыкл С., які адлюстроўвае фундаментальны біярытм «спакой-актыўнасць», яго перыяд у чалавека звычайна 90—100 мін. Стан С. забяспечваецца разгалінаванай сістэмай нейронных утварэнняў, якая ахоплівае амаль усе ўзроўні мозга. Мазгавы крываток і паглынанне кісларoду ў час С. не ніжэй, чым пры няспанні, таму С. адносіцца да асоба арганізаванай дзейнасці мозга, а не да стану функцыян. дэзактывацыі, спакою, затарможанасці клетак. У час С. перапрацоўваецца інфармацыя, што паступіла пры няспанні і мае адносіны да засваення новага вопыту, памяці і аховы ад стрэсу.

Літ.: Р о т е н б е р г В.С. Адаптивная функция сна: Причины и проявления ее нарушения. М., 1982; С у д а к о в К.В. Общая теория функциональных систем. М., 1984.

С.С.Ермакова.

СОН (Pulsatilla), род кветкавых раслін сям. казяльцовых. Больш за 35 відаў. Пашыраны пераважна ва ўмераным поясе Паўн. паўшар'я. На Беларусі 3 віды С.: лугавы (P. pratensis), занесены ў Чырв. кнігу, чарнеючы (P.nigricans), часам яго аб'ядноўваюць у адзін від з лугавым, і шыракалісты, або раскрыты, ці сон-трава (P.patens), нар. назвы булдоўнік, друмель, курчаннік, саксоннік. Трапляюцца пераважна ў хваёвых лясах, на высечках, лугах. У культуры С. албанскі (P.albana), вясенні (P.vernalis), горны (P.montana).

Шматгадовыя травяністыя карэнішчавыя расліны выш. да 50 см. Лісце ў прыкаранёвай разетцы, на доўгіх чаранках, пальчата- або перыстарассечанае. Кветкі адзіночныя на апушаных кветаносных сцёблах, буйныя, правільныя, пераважна фіялетавага колеру. Плод — шматарэшак. Лек., дэкар., ядавітыя расліны.

А.М.Скуратовіч.

СО́НА (Saône), рака на У Францыі, правы, самы вялікі прыток р. Рона. Даўж. 482 км, пл. бас. каля 30 тыс. км^2 (частка бас. на тэр. Швейцарыі). Вытокі ў паўд. ч. Латарынгскага плато, цячэ на Пд па раўнінах Бургундыі. Асн. прыток — р. Ду. Найб. воднасць у ліст.— красавіку. Сярэдні расход вады каля 400 м^3/с. Суднаходная, рэчышча шлюзаванае. Злучана каналамі з рэкамі Луара, Марна, Мозель, Рэйн, Сена. У вусці С. — г. Ліён.

СО́НГІН Восіп Восіпавіч (28.1.1850, г. Гродна — 10.2.1902), расійскі інжынер і тэхнолаг. Скончыў С.-Пецярбургскі тэхнал. ін-т (1875). З 1898 праф. Харкаўскага тэхнал. ін-та. Аўтар манаграфіі «Сталь як матэрыял для будаўнічай справы і машынабудавання» (ч. 1—3, 1894) і шэрагу артыкулаў, сярод якіх «Значэнне вышэйшай тэхнічнай адукацыі для рускай прамысловасці» (1896).

Літ.: О.О.Сонгин // Вестн. о-ва технологов. СПб., 1903. Т. 10, №3.

А.А.Гусак.

СО́НЕЧНАЯ АКТЫ́ЎНАСЦЬ, змена ў часе інтэнсіўнасці выпрамянення асобных участкаў паверхні *Сонца*. Праяўляецца ва ўсёй сукупнасці нестацыянарных працэсаў на Сонцы і ў яго атмасферы: рэгулярным узнікненні плям, *пратуберанцаў*, факелаў, успышак і інш., нарастанні ультрафіялетавага, рэнтгенаўскага і радыёвыпрамянення.



Сон: 1 — звычайны; 2 — вясенні; 3 — лугавы; 4 — раскрыты.

Большасць гэтых з'яў цесна звязаны паміж сабой і ўзнікаюць у т.зв. цэнтрах актыўнасці, дзе выходзяць на паверхню магутныя магн. палі, што сведчыць аб агульнай прыродзе праяўленняў С.а. — сувязі з магн. полем Сонца. С.а. мае цыклічны характар — перыяд каля 11 гадоў. Пры змене цыкла С.а. мяняецца палярнасць агульнага магн. поля Сонца, а ў групах плям — палярнасць вядучай плямы; т.ч. магн. поле вяртаецца да агульнай канфігурацыі праз 22 гады. Мерай С.а. служыць *Вольфа лік*. Звычайна яго значэнні ўсярэдняюць па месяцах ці гадах і будуюць графік залежнасці С.а. ад часу. С.а. значна ўздзейнічае на працэсы, якія адбываюцца ў міжпланетнай і каляземнай прасторах, у атмасферы і біясферы Зямлі. У перыяд максімуму С.а. на Зямлі маюць месца анамальныя з'явы: *магнітныя буры*, *палярныя ззянні*, спыненне радыёсувязі на частотах 5—20 Мгц, поўнае спыненне адбіцця ад іанасферных слаёў, раптоўнае ўзмацненне атм. перашкод і інш. Іл. гл. да арт. *Пратуберанцы*.

Літ.: Витинский Ю.И. Солнечная активность. 2 изд. М., 1983. *А.А.Шымбалёў.*

СО́НЕЧНАЯ БАТАРЭ́Я, фотаэлектрычны генератар, прыстасаванне, якое непасрэдна пераўтварае энергію сонечнага выпрамянення ў электрычную. Мае выгляд панэлі з паўправадніковых *фотаэлементаў*, дзеянне якіх заснавана на з'яве ўнутранага *фотаэфекту*. Магутнасць, што генерыруецца С.б., дасягае некалькіх дзесяткаў кілават. Выкарыстоўваецца як аўтаномная крыніца энергіі на касм. апаратах, аўтам. метэастанцыях, пераносных радыёстанцыях і інш.

СО́НЕЧНАЯ КАРО́НА, вонкавая частка атмасферы *Сонца*. Складаецца з гарачага газу — іанізаванай *плазмы* (т-ра $\geqslant 10^6$ К) нізкай шчыльнасці ($\approx 10^{-13}$ кг/м^3). Знаходзіцца над *храмасферай* і распасціраецца на мільёны кіламетраў ад сонечнай паверхні. Не мае выразных абрысаў; форма няправільная, мяняецца ў часе. Найб. яркую частку С.к., аддаленую ад бачнага краю не больш чым на 0,2—0,3 радыуса Сонца, наз. унутранай каронай, астатнюю вельмі працяглую частку — вонкавай. Унутраная карона мае шмат структурных утварэнняў, падобных на дугі, петлі, асобныя воблакі (гл. *Пратуберанцы*). Вонкавая карона бесперапынна пашыраецца ў міжпланетную прастору ў выглядзе *сонечнага ветру*. С.к. мае праменную структуру (прамяні рознай даўжыні — да 10 і больш сонечных радыусаў). Назіраюць С.к. ў шырокім дыяпазоне спектра — ад рентгенаўскага да радыёвыпрамянення; у бачным дыяпазоне яе выпрамяненне з'яўляецца рассеяным святлом *фотасферы*. *А.А.Шымбалёў.*

СО́НЕЧНАЯ ПАСТАЯ́ННАЯ, колькасць праменнай энергіі *Сонца*, якая падае па-за атмасферай Зямлі за адзінку часу на пляцоўку адзінкавай плошчы, размешчаную перпендыкулярна сонечным праменям на сярэдняй адлегласці ад Зямлі да Сонца (1 а.а.). С.п. роўная 1369 ± 14 Вт/м^2. У пач. 1980-х г. выяўлена пераменнасць С.п., звязаная з сонечным цыклам; пазней выяўлены яе варыяцыі, магчымымі прычынамі якіх



Утварэнне і рух плям на Сонцы ў перыяд **сонечнай актыўнасці** (жнівень 1999).

могуць быць сонечныя плямы, сонечныя факелы, змена магн. палёў і інш. Веданне С.п. неабходна для вырашэння праблем астрафізікі, геафізікі, экалогіі і інш.

СО́НЕЧНАЯ ПЕЧ, геліяўстаноўка для плаўкі і тэрмаапрацоўкі матэрыялаў. Складаецца з *геліяканцэнтратара*, камеры нагрэву (уласна печ) і аўтам. сістэмы паварочвання геліяканцэнтратара ў напрамку да Сонца. Камера нагрэву звычайна герметычная ёмістасць з святлопранікальным акном, размяшчаецца ў фокусе геліяканцэнтратара. У ёй можна ствараць вакуум, атмасферу інертных газаў і інш. ўмовы, неабходныя для канкрэтнай тэрмаапрацоўкі. Т-ра ў С.п. 3500—3800 °С.

СО́НЕЧНАЯ РАДЫЯ́ЦЫЯ, сонечнае выпрамяненне, электрамагнітнае і карпускулярнае выпрамяненне Сонца; асноўная крыніца энергіі для ўсіх працэсаў і з'яў, што адбываюцца ў біясферы. Электрамагнітная радыяцыя распаўсюджваецца ў касм. прасторы і дасягае атмасферы Зямлі ў выглядзе эл.-магн. хваль са скорасцю каля 300 тыс. км/с. С.р. адносіцца да кароткахвалевай радыяцыі. Каля 47% яе энергіі прыпадае на бачную частку спектра (0,4—0,76 мкм), 44% — на інфрачырвоную (0,76—4 мкм) і 9% — на ультрафіялетавую радыяцыі (0,01— 0,39 мкм). С.р. праходзіць праз атмасферу, часткова адбіваецца ў космас, часткова паглынаецца і рассейваецца малекуламі газаў і аэразолямі, зменьвае сваю інтэнсіўнасць і спектральны састаў. Радыяцыя, што дасягае зямной паверхні ў выглядзе пучка паралельных прамянёў непасрэдна ад Сонца, наз. прамой, а радыяцыя, якая паступае з усяго небасхілу, — рассеянай. Агульны прыход прамой і рассеянай радыяцыі — сумарная радыяцыя. Частка яе, якая паглынаецца паверхняй (глебай, расл. покрывам, вадой, будынкамі і інш.), наз. паглынутай радыяцыяй, а тая, што адбіваецца воблакамі і зямной паверхняй — адбітай радыяцыяй. Суадносіны паміж паглынутай і адбітай радыяцыямі залежаць ад колеру, рэльефу і вільготнасці паверхні. Зямная паверхня і атмасфера выпраменьваюць даўгахвалевую радыяцыю (4—100 мкм). Рознасць паміж выпрамяненнем Зямлі і сустрэчным выпрамяненнем атмасферы наз. *эфектыўным выпрамяненнем*; рознасць паміж паглынутай радыяцыяй і эфектыўным выпрамяненнем — *радыяцыйны баланс*, прамянёвая энергія якога на зямной паверхні пераўтвараецца ў цяпло. Частка цяпла перадаецца на глыбіню глебы або вадаёма, частка ў атмасферу, на выпарэнне вады, невял. доля ідзе на ўтварэнне хім. сувязей пры фотасінтэзе расл. покрыва. Агульны прыход і расход энергіі на зямной паверхні наз. *цеплавым балансам*. Карпускулярная радыяцыя складаецца пераважна з пратонаў (рухаюцца са скорасцю 300—1500 км/с), якія поўнасцю паглынаюцца магнітасферай Зямлі. С.р. характарызуецца імгненнымі значэннямі (энергет. асветленасць, кВт/м^2) і сумамі за гадзіну, суткі, месяц, год (КДж/м^2, МДж/м^2). На Беларусі колькасць сумарнай С.р. за год зменьваецца ад 4100 МДж/м^2 на Пд да 3500 МДж/м^2 на Пн, каля 55% яе прыпадае на рассеяную радыяцыю. Гадавыя сумы радыяцыйнага балансу ад 1500 МДж/м^2 на ПнУ да 1800 МДж/м^2 на ПдЗ. *П.А.Каўрыга.*



Сонечная батарэя: 1 — панэль сонечных фотаэлементаў; 2 — корпус з прыладамі.



Сонечная карона.

СО́НЕЧНАЯ СІСТЭ́МА, сукупнасць нябесных цел, якія рухаюцца ў вобласці пераважнага ўздзеяння гравітацыйнага поля *Сонца*. Складаецца з цэнтр. цела — Сонца, 9 вял. планет (*Меркурый*, *Венера*, *Зямля*, *Марс*, *Юпітэр*, *Сатурн*, *Уран*, *Нептун*, *Плутон*), больш за 60 *спадарожнікаў планет*, мноства *малых*

планет (астэроідаў), *камет, метэорных патокаў*, міжпланетнага пылу і газу і інш. Больш за 99% масы С.с. складае маса Сонца.

С.с. знаходзіцца паблізу цэнтр. плоскасці *Галактыкі* на адлегласці каля 10 кпк ад яе цэнтра, лінейная скорасць вярчэння С.с. вакол яго 250—300 км/с. Разам з Сонцам рухаецца адносна бліжэйшых зорак у напрамку да сузор'я Геркулес са скорасцю 20 км/с. Вял. планеты рухаюцца вакол Сонца ў напрамку восевага вярчэння Сонца па эліптычных арбітах, у адным з фокусаў якіх знаходзіцца Сонца (самая выцягнутая арбіта ў Плутона, найб. блізкія да кругавых арбіты Венеры і Нептуна); плоскасці арбіт мала нахілены адна да адной і да сонечнага экватара. Планеты-гіганты маюць кольцы; у 7 планет ёсць спадарожнікі. Малыя планеты таксама абарачаюцца вакол Сонца ў тым жа напрамку; іх арбіты значна выцягнутыя і нахіленыя да плоскасці экліптыкі. Паміж арбітамі Марса і Юпітэра ёсць пояс астэроідаў, у які ўваходзяць тысячы малых планет; за арбітай Нептуна існуе астэроідны пояс Койпера, які складаецца з мноства малых ледзяных планет, падобных да Плутона. Некалькі мільярдаў камет складюць сферычнае каметнае воблака Аорта (каля 50 тыс. а.а. ад Сонца). С.с. знаходзіцца ў магн. полі Сонца. Яе пранізвае *сонечны вецер*. Паходжанне і развіццё С.с. вывучае планетная *касмагонія*.

Літ.: Солнечная система: Пер. с англ. М., 1978; Альвен Х., Аррениус Г. Эволюция солнечной системы: Пер. с англ. М., 1979; Уипл Ф.Л. Семья Солнца: Пер. с англ. М., 1984.

А.А.Шымбалёў.

СО́НЕЧНАЯ ЭЛЕКТРАСТА́НЦЫЯ, устаноўка (*электрастанцыя*), якая пераўтварае *сонечную радыяцыю* ў цеплавую або электрычную энергію. Адрозніваюць тэрмадынамічныя С.э., у якіх сонечная энергія паслядоўна пераўтвараецца ў цеплавую, а затым — у электрычную (напр., па цыкле: *геліяканцэнтратары* — паравы кацёл—турбіна—генератар) і фотаэлектрычныя станцыі, якія непасрэдна, з дапамогай *сонечных батарэй*, пераўтвараюць энергію сонечнага выпрамянення ў электрычную. С.э. выкарыстоўваюцца для электразабеспячэння розных аб'ектаў, у т.л. касм. апаратаў, апраснення вады і інш. Магутнасць тэрмадынамічных С.э. больш за 30 МВт, фотаэл. — больш за 10 МВт.



Варыянт касмічнай **сонечнай электрастанцыі**: 1 — люстэркі; 2 — монакрышталічныя (крэмніевыя) сонечныя элементы, якія пераўтвараюць энергію сонечнага выпрамянення ў электрычную; 3 — перадавальная лінія; 4 — звышвысокачастотнае выпрамяненне, якое пераносіць пераўтвораную электраэнергію на зямлю; 5 — станцыя кіравання.

СО́НЕЧНАЯ ЭНЕРГЕТЫ́ЧНАЯ ЎСТАНО́ЎКА, разнавіднасць *геліяўстаноўкі*, якая пераўтварае энергію *сонечнай радыяцыі* ў цеплавую або эл. энергію. У нізкатэмпературных С.э.у. выкарыстоўваюць сонечнае выпрамяненне натуральнай шчыльнасці (0,8 кВт/м^2), у высокатэмпературных яго шчыльнасць павышаюць у 10^2—10^4 разоў, выкарыстоўваючы *геліяканцэнтратары*. С.э.ў. экалагічна чыстыя крыніцы цеплавой і эл. энергіі, яны выкарыстоўваюцца для гарачага водазабеспячэння жылых памяшканняў, электразабеспячэння касм. апаратаў і інш. Да С.э.ў. адносяцца *сонечныя электрастанцыі*.

СО́НЕЧНІКІ (Heliozoa), клас (раней падкл.) прасцейшых падтыпу саркода-



Сонечнікі: 1 — актынофрыс сол; 2 — актынасферыум эйхорні; 3 — клатруліна зграбная.

вых. Некалькі дзесяткаў прэснаводных і марскіх відаў. На Беларусі найб. пашыраны ў сажалках і канавах: Actinosphaerium eichhorni, Actinophrys sol, клатруліна зграбная (Clathrulina elegans).

Цела дыям. да 1 мм, шарападобнае з ніткападобнымі радыяльнымі адросткамі — аксаподыямі. Па вусі кожнай аксаподыі праходзіць пучок мікратрубачак. Частка С. пазбаўлена мінер. шкілета, у некат. ён з крэменязёму. У вегетатыўных форм адно ці некалькі ядраў, бывае больш за 200. Маюць пульсуючую і стрававальную *вакуолі*. Размнажэнне бясполае (дзяленне папалам, пачкаванне) і палавое (з утварэннем амёбападобных, радзей жгуцікавых гамет). Кормяцца водарасцямі, дробнымі прасцейшымі, калаўроткамі і інш.

СО́НЕЧНЫ БЕ́РАГ, кліматычны курорт у Балгарыі, на беразе Чорнага м., на Пн ад г. Несебыр. Засн. ў 1958. Клімат марскі, зіма мяккая, лета цёплае, сонечнае (сярэдняя т-ра ліпеня 24 °С). Асн. лек. фактары: клімата-, сонца-, вінаградалячэнне, марскія купанні (з чэрв. па кастр.). Лечаць хваробы органаў дыхання, функцыян. расстройствы нерв. сістэмы. Курортная паліклініка, пансіянаты, гасцініцы. Буйны цэнтр летняга адпачынку і турызму.

СО́НЕЧНЫ ВЕ́ЦЕР, пастаяннае радыяльнае распаўсюджванне *плазмы* сонечнай кароны ў міжпланетную прастору. Утварэнне С.в. звязана з патокам энергіі, што паступае ў *сонечную карону* з больш глыбокіх слаёў Сонца. Пры высокіх т-рах, якія існуюць у кароне ($1{,}5\cdot10^6$ К), ціск яе вышэйшых слаёў не ўраўнаважвае газавы ціск рэчыва кароны, і яна расшыраецца. С.в. складаецца з пратонаў, электронаў, невял. колькасці іонаў гелію і інш. Структура С.в. звязана з магн. полем Сонца і мяняецца са зменай *сонечнай актыўнасці*. За кошт С.в. Сонца губляе 10^{-14} Дж/с энергіі і штогод 10^{-14} часткі масы. У межах арбі-



Сонечная сістэма.

ты Зямлі канцэнтрацыя пратонаў 6 $см^{-3}$, скорасць 400 км/с. Пры набліжэнні С.в. да Зямлі на мяжы з яе магнітасферай узнікае магнітагідрадынамічная ўдарная хваля, што прыводзіць да істотных дэфармацый *магнітнага поля Зямлі* — узнікаюць *магнітныя буры*. *А.А.Шымбалёў.*



Абцяканне **сонечным ветрам** магнітасферы Зямлі.

СО́НЕЧНЫ ВАДАНАГРАВА́ЛЬНІК, разнавіднасць *геліяўстаноўкі*, якая выкарыстоўваецца для нагрэву вады. Звычайна выконваецца па тыпу тэрмаізаляванай «гарачай скрыні» для душавых, пральняў і інш. Т-ра нагрэву 50—60 °С.

Паверхня С.в., якая абпраменьваецца сонечнай радыяцыяй, арыентуецца на Пд і ўстанаўліваецца пад вуглом 25—35° да гарызонту. Цёплая вада падымаецца ўверх і назапашваецца ў расходным баку, халодная паступае ў ніжнюю частку катла. Плоскі або трубчасты кацёл устанаўліваюць у зашклёную зверху «скрыню». С.в. бываюць з натуральнай і прымусовай (з дапамогай помпаў) цыркуляцыяй, часам з прыстасаваннямі для змены вугла нахілу ў залежнасці ад пары года.



Сонечны воданагравальнік: 1 — геліяводападагравальнік; 2 — бак.



Сонечны гадзіннік.

СО́НЕЧНЫ ГАДЗІ́ННІК, прылада для вызначэння дзённага часу па Сонцы; адзін з найб. старажытных *гадзіннікаў*. Па ценю, што адкідваецца пласцінай (стрыжнем) на цыферблат, вызначаецца сапраўдны сонечны час з дакладнасцю некалькіх мінут. Вядомы з 3-га тыс. да н.э.; у наш час выкарыстоўваецца ў дэкар. мэтах (для ўпрыгожвання садоў, паркаў), аднаўляецца ў гіст. месцах.

Адрозніваюць С.г. экватарыяльныя (плоскасць цыферблата паралельная плоскасці нябеснага экватара), гарызантальныя (цыферблат гарызантальны) і вертыкальныя (цыферблат вертыкальны, размяшчаецца звычайна на сценах збудаванняў). Ва ўсіх тыпах С.г. стрыжань (край пласціны), што адкідвае цень, арыентаваны паралельна *восі свету* і перасякае цыферблат у яго цэнтры; дзяленне цыферблата, адпаведнае поўдню, знаходзіцца ў плоскасці мерыдыяна, што праходзіць праз гэты цэнтр. *С.В.Багдановіч.*

СО́НЕЧНЫ ГОД, трапічны год, час паміж 2 паслядоўнымі праходжаннямі цэнтра Сонца праз пункт вясенняга *раўнадзенства* (365,2422 сут). Адпавядае перыяду, за які на Зямлі адбываецца змена пораў года — вясны, лета, восені, зімы. Гл. таксама *Каляндар*.

СО́НЕЧНЫ КАЛЯНДА́Р, гл. ў арт. *Каляндар*.

СО́НЕЧНЫ КА́МЕНЬ, мінерал, паўпразрысты *плагіяклаз* (авантурынавы *палявы шпат*) з лускавінкамі *гематыту* або гётыту ці слюды і залацістым мігценнем. Вырабны камень.

СО́НЕЧНЫ ТЭЛЕСКО́П, тып *тэлескопа* для назіранняў Сонца. С.т. з аб'ектывамі невял. дыяметраў і фокусных адлегласцей звычайна маюць паралактычную манціроўку. Да іх адносяцца *караногафы*, фотасферныя і храмасферныя тэлескопы з інтэрферэнцыйна-палярызацыйнымі фільтрамі, што дае магчымасць назіраць Сонца ў святле вадароднай лініі H_α. Буйныя С.т. маюць сістэму рухомых плоскіх люстраў (цэластат) для накіравання сонечнага святла ў нерухомы тэлескоп, а таксама розныя прыборы для даследаванняў Сонца — *спектрографы*, *магнітографы*, фатаграфічныя камеры, фотаэл. прыёмнікі святла і інш. У залежнасці ад напрамку аптычнай восі адрозніваюць С.т. гарызантальныя і вежавыя з вертыкальнай або нахіленай вежай. *Я.У.Чайкоўскі.*

СО́НЕЧНЫ ТЭРМАЭЛЕКТРЫ́ЧНЫ ГЕНЕРА́ТАР, прыстасаванне для прамога пераўтварэння энергіі сонечнага выпрамянення ў электрычную. Звычайна складаецца з *тэрмаэлектрычнага генератара* і сістэмы, што забяспечвае канцэнтрацыю светлавога патоку (*геліяканцэнтратара*). Гарачыя спаі могуць награвацца і непасрэдна сонечнымі прамянямі (без іх канцэнтрацыі). Халодныя спаі ахалоджваюцца патокам вадкасці або натуральным цеплаабменам з навакольным асяроддзем. Перспектыўныя як крыніцы электрасілкавання аўтаномных спажыўцоў магутнасцю да сотняў ват.

СО́НЕЧНЫ ЎДАР, перагравание арганізма ў выніку прамога дзеяння сонечных прамянёў на галаву. Адрозніваецца ад агульнага перагравання арганізма — *цеплавога ўдару*. Вылучаюць 3 ступені С.ў.: лёгкая, сярэдняя, цяжкая. Сімптомы: галаўны боль, моташнасць, ірвота, т-ра да 42 °С і вышэй, часты пульс і дыханне, вял. страта вады, солей, парушэнне функцыі нырак, страта прытомнасці, сутаргі. Лячэнне: ахалоджванне цела, цень, удыханне кісларoду, медыкаментознае. *І.М.Семяненя.*

СО́НЕЧНЫЯ ЗАЦЬМЕ́ННІ, гл. ў арт. *Зацьменні*.

СО́НЕЧНЫЯ СУ́ТКІ, гл. ў арт. *Суткі*.

СО́НІ, соневыя (Gliridae), сямейства млекакормячых атр. грызуноў. Вядомы з алігацэну (каля 35 млн. г. назад). 7—8 родаў: С. арэшнікавыя (Muscar-



Соні: 1 — арэшнікавая; 2 — садовая; 3 — лясная; 4 — вялікая.

dinus), лясныя (Dryomys), С.-палчкі (Glis), садовыя (Eliomys) і інш.; 17 відаў. Пашыраны ў лясах і лесастэпах Еўразіі, лясах і саваннах Афрыкі, у Японіі. Жывуць у гнёздах, дуплах, норах. На зіму ўпадаюць у спячку. На Беларусі трапляюцца С.: арэшнікавая (M. avellanarius), садовая (E. quercinus) — занесены ў Чырв. кнігу; вялікая (G. glis), лясная (D. nitedula).

Даўж. цела да 20 см, хваста да 17 см., маса да 180 г. Футра густое, мяккае. Хвост у лясных відаў густа апушаны, у наземных паўголы. Кормяцца пладамі, насеннем, насякомымі, яйцамі птушак. Нараджаюць да 10 дзіцянят.

Э.Р.Самусенка.

СО́НІН Алег Барысавіч (н. 10.4.1948, Берлін), бел. кампазітар. Скончыў Бел. кансерваторыю (1974, кл. М.*Аладава* і А.*Багатырова*). З 1974 выкладаў у Лідскім муз. вучылішчы, у мінскіх муз. школах, з 1979 у Мінскім муз. вучылішчы імя М.Глінкі. Прыхільнік сучаснага муз. авангарда з шырокім вобразным дыяпазонам, экспрэсіўнасцю, трагедыйнай і лірыка-рамант. накіраванасцю. У творах выкарыстоўвае дадэкафонную і постдадэкафонную тэхніку пісьма, алеаторыку, санорыку, шматэлементную поліметрыю. Аўтар балета «Каханне Сапфо» (1998—2001), 4 сімфоній (1-я, 1974; 2-я «Zorca in memoriam», 1985; 3-я «Прысвячэнне Сапфо», 1987; 4-я «Музыка для Восіпа Мандэльштама» для фп., 1992), кантаты «Родная зямля» на вершы Я.Купалы і ўласныя (1975), 3 канцэртаў (1980—2001), камерна-інстр. ансамбляў, вак. цыклаў «Родны край» на вершы А.Бачылы, «Пад вечнымі соснамі» на вершы Р.Барадуліна (абодва 1978), «Месяцовыя песні» на вершы Ф.Гарсія Лоркі (1989), твораў для фп. і інш. Заснавальнік (1990) і прэзідэнт (да 1995) Бел. асацыяцыі сучаснай музыкі.

Н.А.Юўчанка.

СО́ННАЕ АЧМУРЭ́ННЕ, кветкавая расліна, гл. ў арт. *Красаўка.*

СО́ННАЯ ХВАРО́БА, афрыканскі трыпанасамоз, захворванне чалавека, якое выклікаюць *трыпанасомы*; адна з *трансмісіўных хвароб*. Сустракаецца ў многіх краінах Афрыкі. Пераносчык — муха цэцэ. Прыкметы: прыступы ліхаманкі, высыпка на скуры, павелічэнне лімфатычных вузлоў, пашкоджанні ц.н.с., санлівасць. Лячэнне хіміятэрапеўтычнае.

СО́ННЫЯ АРТЭ́РЫІ, крывяносныя сасуды, якія забяспечваюць галаву і большую частку шыі пазваночных жывёл і чалавека крывёй. Размешчаны ў вобласці шыі. Прыісканне С.а. выклікае страту прытомнасці (адсюль назва).

У чалавека агульныя С.а. адыходзяць справа ад плечагалаўнога ствала, злева — ад дугі аорты; кожная з іх падзяляецца на вонкавую і ўнутр. артэрыі. Вонкавая забяспечвае крывёю вобласць шыі, твару, галавы, адпаведныя мышцы і органы, цвёрдую мазгавую абалонку; унутр. — галаўны мозг, вочы, вобласці лба і носа. Паміж галінамі вонкавай і ўнутр. С.а. існуюць шматлікія злучэнні — *анастамозы.*

А.С.Леанцюк.

СОН-ТРАВА́, кветкавая расліна, гл. ў арт. *Сон.*

СО́НЦА, асноўная крыніца энергіі для ўсіх працэсаў на Зямлі; распалены плазменны шар, найбліжэйшая да Зямлі *зорка*; цэнтральнае цела *Сонечнай сістэмы*. Астр. знак ☉. Маса $1{,}99 \cdot 10^{30}$ кг (каля 99% масы Сонечнай сістэмы), радыус 690 тыс. км, сярэдняя шчыльнасць $1{,}409 \cdot 10^3$ кг/м^3 (цэнтр. абласцей $1{,}55 \times \times 10^5$ кг/м^3, на паверхні $3 \cdot 10^{-4}$ кг/м^3). Тыповая зорка-*карлік* спектральнага класа 2 з абс. *зорнай велічынёй* +4,85. Свяцільнасць $3{,}86 \cdot 10^{23}$ кВт. Эфектыўная т-ра паверхні каля 5785 К. Напружанасць агульнага магн. поля адносна невялікая ~80А/м, мяняецца ў часе, у актыўных абласцях дасягае ~100 кА/м. С. верціцца ў тым жа напрамку, што і Зямля, вакол восі, нахіленай да плоскасці зямной арбіты пад вуглом 82°45′. Перыяд абарачэння (сінадычны) мяняецца ад 27 сут на экватары да 32 сут каля полюсаў, лінейная скорасць пунктаў каля экватара ~2 км/с, паскарэнне свабоднага падзення 274 м/с^2. Адлегласць ад цэнтра Галактыкі 10 кпк, перыяд абарачэння вакол яго ≈ 220 млн. гадоў, арбітальная скорасць 250—300 км/с. Адносна бліжэйшых зорак С. рухаецца са скорасцю 20



Сонца.

км/с у напрамку да сузор'я Геркулес. Прыблізны ўзрост С. каля 5 млрд. гадоў (паводле тэарэт. мадэлей будзе актыўна існаваць прыблізна такі ж час).

Складаецца з ядра, зоны праменнага пераносу энергіі, канвектыўнай зоны, *фотасферы, храмасферы і сонечнай кароны*. Зямны назіральнік бачыць паверхневую вобласць С. — фотасферу. Паводле спектральных даследаванняў яна складаецца з 90% вадароду, 9,9% гелію і 0,1% жалеза, кальцыю, натрыю і інш. Крыніца сонечнай энергіі — *тэрмаядзерныя рэакцыі* ператварэння вадароду ў гелій у ядры С., дзе т-ра ≈ 15 млн. К. Энергія з нетраў пераносіцца выпрамяненнем, потым у вонкавым слоі таўшчынёй каля 0,2 радыуса — канвекцыяй. Інтэнсіўнасць плазменных працэсаў на С. перыядычна мяняецца (11-гадовы цыкл; гл. *Сонечная актыўнасць*). Сонечная атмасфера (храмасфера і карона) вельмі дынамічная, у ёй назіраюцца ўспышкі, *пратуберанцы*, пастаяннае выцяканне рэчыва ў міжпланетную прастору (гл. *Сонечны вецер*). Зямля знаходзіцца на адлегласці 149,6 млн. км ад С. і атрымлівае за 1 с каля $2 \cdot 10^{17}$ Дж сонечнай праменнай энергіі (гл. *Сонечная пастаянная*).

Літ.: Гибсон Э. Спокойное солнце: Пер. с англ. М., 1977; Каплан С.А. Пикельнер С.Б., Цытович В.Н. Физика плазмы солнечной атмосферы. М., 1977; Никольский Г.М. Невидимое Солнце. М., 1980; Крюгер А. Солнечная радиоастрономия и радиофизика: Пер. с англ. М., 1984.

А.А.Шымбалёў.

СО́НЦАВА Юлія Іпалітаўна (7.8.1901, Масква — 1989), расійская і ўкр. актрыса і рэжысёр. Нар. арт. СССР (1981). Скончыла Дзярж. ін-т муз. драмы (1922). Першая роля ў фільме «Аэліта» (1924). З 1930 працавала са сваім мужам рэж. А.*Даўжэнкам*, з якім паставіла фільмы «Шчорс» (1939), «Мічурын» (1949, Дзярж. прэмія СССР) і інш. Сярод значных работ С. фільмы паводле сцэнарыяў Даўжэнкі «Паэма пра мора» (1958), «Аповесць палымяных гадоў» (1961, прыз Міжнар. кінафестывалю ў Канах), «Зачараваная Дзясна» (1964, спец. прыз Міжнар. кінафестывалю ў Сан-Себасцьяне, 1965), «Незабыўнае» (1968), «Такія высокія горы» (1974), «Свет у трох вымярэннях» (1980) і інш. Знялася ў фільмах «Леон Куцюр'е» (1927), «Бура» і «Джымі Хігінс» (1928), «Дзве жанчыны» (1930) і інш.

СОНЦАЛЯЧЭ́ННЕ, геліятэрапія, выкарыстанне *сонечнай радыяцыі* з лек. і прафілакт. мэтамі. Бывае агульнае і мясцовае, праводзіцца на пляжы або ў *салярыі*. Гал. фактары — інфрачырв. і ультрафіялетавае выпрамяненні. Гал. эфекты С. — цеплавы, бактэрыцыдны, утварэнне ў скуры вітаміну Д3, *меланіну*, актывацыя імуннай сістэмы, паскоранае ачышчэнне арганізма ад таксінаў і інш. Выкарыстоўваецца дазіравана, пры светлавым «галаданні», парушэннях абмену рэчываў, недахопе вітаміну Д3, вялацякучым туберкулёзе, ранах, язвах, пераломах касцей, псарыязе і інш.

І.М.Семяненя.

СОНЦАСТАЯ́ННЕ, момант часу, калі цэнтр Сонца пры бачным руху па *нябеснай сферы* праходзіць праз самы паўн. пункт (схіленне +23°27′) ці праз самы паўд. пункт (схіленне -23°27′) эклiптыкі. Адпаведна такія пункты наз. пунктамі летняга (21 ці 22 чэрвеня) і зімовага (21 ці 22 снежня) С.

Паблізу пунктаў С. Сонца рухаецца па эклiптыцы амаль паралельна экватару і як бы стаіць некалькі дзён на адной вышыні (адсюль назва). У перыяд летняга С. ва ўсіх пунктах Паўн. паўшар'я Зямлі дзень самы доўгі, а ноч самая кароткая, у перыяд зімовага С. — наадварот.

СО́НЦАЎ Канстанцін Міхайлавіч (13.4.1914, с. Соф'іна Раменскага р-на Маскоўскай вобл. — 7.11.1995), бел. вучоны ў галіне жывёлагадоўлі. Акад. УАСГНІЛ (1978, чл.-кар 1966). Д-р с.-г. н. (1965), праф. (1966). Засл. дз. нав. Беларусі (1973). Скончыў Пушкінскі

с.-г. ін-т (1938). З 1958 заг. лабараторыі Бел. НДІ жывёлагадоўлі, з 1964—77 рэктар БСГА. З 1977 дырэктар Усесаюзнага НДІ жывёлагадоўлі (Масква). Навук. працы па пытаннях мінер., бялковага, вітаміннага кармлення жывёлы і тэарэт. асновах рацыянальнага выкарыстання біялагічна актыўных рэчываў у кармленні жывёлы. Арганізатар прамысл. вытв-сці кармавых дабавак і іх выкарыстання для ўзбагачэння камбікармоў на Беларусі.



К.М.**Сонцаў**.

Тв.: Антибиотики в кормлении сельскохозяйственных животных. Мн., 1960; Стимуляторы роста сельскохозяйственных животных. М.; Л., 1963 (у сааўт.); Справочник по кормовым добавкам. Мн., 1975 (у сааўт.); Производство и использование премиксов. Л., 1980 (у сааўт.).



Сонцацвет манеталісты.

СО́НЦАЦВЕ́Т (Helianthemum), род кветкавых раслін сям. ладаннікавых. Больш за 100 відаў. Пашыраны ў Еўропе, Міжземнамор'і, Зах. і Сярэдняй Азіі, Афрыцы. Растуць на сухіх камяністых схілах, у стэпах, паўпустынях. На Беларусі 2 віды — С. манеталісты (H. nummularium), і звычайны (H.chamaecistus). Трапляюцца ў сухіх хваёвых лясах, на ўзлесках.

Аднагадовыя травы, кусцікі, паўкусцікі. Лісце супраціўнае, з прылісткамі. Кветкі зацёды павернуты да сонца (адсюль назва), пераважна жоўтыя, у гронкападобных суквеццях. Плод — каробачка. Дэкар. расліны.

А.М.Скуратовіч.

СО́ПАТ (Sopot), горад на Пн Польшчы, на ўзбярэжжы Гданьскага зал. Балтыйскага м., у гар. агламерацыі *Труймяста* (разам з гарадамі Гданьск і Гдыня), у Паморскім ваяводстве. Каля 50 тыс. ж. (2001). Чыг. ст., вузел аўтадарог. Прам-сць: харч., гарбарная, машынабудаўнічая. Марскі курорт. Санаторыі, водагразялячэбніца, дамы адпачынку, пансіянаты, атэлі. Міжнар. фестываль эстраднай песні (з 1961).

СО́ПАТ Аляксандр Сцяпанавіч (н. 23.2.1936, в. Партызанская Хойніцкага р-на Гомельскай вобл.), бел. пісьменнік. З 1951 працаваў на суднах гандлёвага і тралавага флотаў, у 1965—82 працаваў на будаўніцтве ў Гомелі. Друкуецца з 1965. Піша на рус. мове. Аповесці «Спытай самога сябе» (1976), «Аляксей Чарняк» (1978), зб. аповесцей «Траса» (1982) пра жыццё рабочага чалавека. Аўтар нарысаў, апавяданняў.

Тв.: Самотлор: Повести. Мн., 1987; Корабли: Повести. Мн., 1989.

СО́ПАЦКАЯ НАРА́ДА 1925. Адбылася ў канцы жн. 1925 у г. Сопат (прыгарад Гданьска). Удзельнічалі прадстаўнікі Цэнтр. к-таў КП(б)Б, КПЗБ і КПП, Камінтэрна: У.М.Ігнатоўскі, А.С.Славінскі, А.Ф.Ульянаў, а таксама Б.А.Тарашкевіч, Р.К.Астроўскі, С.А.Рак-Міхайлоўскі, І.Шнаркевіч, М.М.Марцінчык, С.А.Мертэнс, Л.Н.Аранштам, П.Корчык (І.К.Лагіновіч, арганізатар нарады), М.С.Арэхва. Гал. пытанне С.н. — стварэнне масавай бел. нац.-вызв. арг-цыі ў Зах. Беларусі — *Беларускай сялянска-работніцкай грамады* (БСРГ) і яе ўзаемаадносіны з агульнапольскім рэв. рухам, асабліва з польскай *Незалежнай сялянскай партыяй*. Удзельнікі нарады прыйшлі да высновы, што праграма БСРГ павінна змякчаць патрабаванні рэв.-дэмакр. характару: рабоча-сял. ўрад, зямля для сялян без выкупу, самавызначэнне нацый; прапаноўвалася ўключыць у яе дэмакр. патрабаванні ў паліт. сферы, а таксама па рабочым, сял. і нац. пытаннях. На С.н. заслуханы даклады аб становішчы ў Сав. Саюзе, гасп. і нац.-культ. будаўніцтве ў БССР, становішчы ў Зах. Беларусі і задачах нац.-вызв. руху, разгледжана таксама пытанне аб ліквідацыі ўрада *Беларускай Народнай Рэспублікі*. Была дасягнута дамоўленасць пра фінансаванне дзейнасці БСРГ, Т-ва бел. школы і бел. гімназій, стварэнне для гэтых мэт Бел. кааператыўнага банка ў Вільні з аддзяленнямі ў Пінску і Глыбокім.

У.М.Міхнюк.

СО́ПКА, ізаляваны ўзгорак або гара з акруглай вяршыняй. Тэрмін ужываецца ў Казахстане, Забайкаллі і на Д. Усходзе Расіі; С. называюць таксама некаторыя вулканы Камчаткі (напр., Авачынская С.) і Курыльскіх а-воў, а на Каўказе і ў Крыме — грязевыя вулканы.

СО́ПКІ (ад слова «сыпаць»), пахавальныя збудаванні наўгародскіх (ільменскіх) *славен* у 7—9 ст. Уяўляюць сабой крутабокія насыпы выш. 2—10 м, з плоскай вяршыняй і круглай асновай, выкладзенай камянямі. Будаваліся паступова, у некалькі прыёмаў (пры патрэбе новых пахаванняў), таму маюць шмат'яруснае збудаванне і з'яўляюцца калектыўнымі пахавальнямі вял. патрыярхальных сем'яў з дзесяткамі пахаванняў, у большасці бязурнавых і без інвентару. У С. зрэдку сустракаюцца паясныя спражкі, шкляныя пацеркі, бронзавыя бразготкі і інш. Тэрмін «сопка» сустракаецца ў Гарадоцкім (вёскі Мяжа, Аляксеева, Хацейка, Хабаты і інш.) і Віцебскім (в. Гарадняны) р-нах Віцебскай вобл.

Г.В.Штыхаў.

СО́РАГІ, вёска ў Слуцкім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 30 км на У ад г. Слуцк, 135 км ад Мінска, 9 км ад чыг. ст. Урэчча. 654 ж., 291 двор (2001). 2 дрэваапр. прадпрыемствы. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі. Свята-Міхайлаўская царква. Помнік землякам, які загінулі ў Вял. Айч. вайну.

СО́РБЦЫЯ (ад лац. sorbeo паглынаю), 1) паглынанне цвёрдым целам або вадкасцю рэчываў (вадкасцей ці газаў) з навакольнага асяроддзя. Цела, што паглынае, наз. *сарбентам*, рэчыва, якое паглынаецца,— сарбатам (сарбтывам). Адрозніваюць паглынанне рэчыва ўсім аб'ёмам вадкага сарбенту (*абсорбцыю*), а таксама цвёрдага цела ці расплаву (*аклюзію*) і паверхневым слоем сарбенту (*адсорбцыю*). С., абумоўленую хім. узаемадзеяннем паміж паверхняю цвёрдага сарбенту і сарбатам, наз. *хемасорбцыяй*. Найважн. цвёрдыя сарбенты, якія выкарыстоўваюць у тэхніцы, — актыўны вугаль, *сілікагель, іаніты, цэаліты*.

2) У б і я л о г і і. Для біял. сістэм характэрна высокая спецыфічнасць (выбіральнасць) С., што вызначаецца асаблівасцямі прасторавай канфігурацыі малекул сарбенту. Напр., звязванне малекул CO_2 хларапластамі пры фотасінтэзе ў раслін, прымацаванне фага да паверхні адчувальных да яго бактэрыяльных клетак і інш. У біялагічных сістэмах пашырана адсорбцыя пэўных рэчываў на паверхні клетак і мембран унутрыклетачных структур і абсорбцыя арганоідамі клеткі і малекуламі біяпалімераў.

СО́РГА (Sorghum), род кветкавых раслін сям. метлюжковых (злакавых). Каля 50 відаў. Пашыраны ў трапічных, субтрапічных, часткова — ва ўмераных паясах. Радзіма культурнага С. — Афрыка, у Азіі — С. жылкаватае, або гаалян (S. nervosum), вырошчваюцца з 3-га тыс. да н.э., у Еўропе — з 15 ст., Амерыцы — з 17 ст. Культывуюць у Індыі, Кітаі, ЗША, Афрыцы. Найб. пашыраны С.: кармавое, або цукровае (S. saccharatum), якое мае 14—15% цукру ў сцёблах; зерневае, ці хлебнае (S. durra); суданскае, або суданская трава (S. sudanense); тэхнічнае, ці венікавае (S. technicum).

На Беларусі як заносныя віды трапляюцца С. алепскае, або гумай (S. halepense), і суданскае; вырошчваюць С. двухколернае, ці звычайнае (S. bicolor), і С. тэхнічнае.

Адна- і шматгадовыя травяністыя расліны выш. да 4—5 м і болей, з буйной каранёвай сістэмай, знешне падобныя на кукурузу. Сцёблы моцныя, шчыльныя, прамастойныя. Лісце лінейнае, па краі хвалістае. Агульнае суквецце — мяцёлка разнастайнай формы. Плод — зярняўка. Харч., кармавыя і тэхн. расліны. *А.М.Скуратовіч.*

Тамперэ). З 1959 у органах ЮНЕСКА у Парыжы, у 1965—69 ген. сакратар Нац. камісіі па справах ЮНЕСКА. Адначасова ў 1967—69 у Мін-ве асветы Фінляндыі. З 1969 сакратар, у 1975—87 старшыня С.-д. партыі Фінляндыі. З 1978 старшыня Кансультатыўнага савета Сацыяліст. інтэрнацыянала (Сацінтэрна) па раззбраенні, з 1982 нам. старшыні Сацінтэрна. У 1972 і 1975—77 міністр замежных спраў. У 1972—75, 1977—79, 1982—83 і 1983—87 прэм'ер-міністр Фінляндыі, у 1987—89 нам. прэм'ер-міністра, міністр замежных спраў. З 1970 дэп., з лют. 1989 старшыня парламента Фінляндыі.



Сорга ў фазе цвіцення: 1 — зерневае; 2 — суданскае. Спелыя мяцёлкі: 3 — тэхнічнага; 4 — цукровага; 5, 6 — зерневага.

СО́РДЗІ (Sordi) Альберта (н. 15.6.1919, Рым), італьянскі акцёр, рэжысёр. У кіно з 1937. Стварыў трагікамічныя вобразы ў фільмах рэж. Ф.Феліні «Белы шэйх», «Мамчыны сынкі», М.Манічэлі «Тато і каралі Рыма», «Дробны, дробны буржуа», «Маркіз дэль Грыло», В. Дэ Сікі «Страшны суд», «Бум», Дз.Рызі «Цяжкае жыццё» (у пракаце «Журналіст з Рыма») і інш. Паставіў і зняўся ў фільмах «Лонданскі туман» (1965), «Італьянец у Амерыцы» (1967), «Каханне маё, дапамажы мне» (1969), «Пакуль ёсць вайна, ёсць надзея» (1974, у пракаце «Гандляры смерцю»), «Я ведаю, што ты ведаеш, што я ведаю» (1982), «Таксіст» (1983), «Усіх за краты» (1984) і інш.

СО́РЖЫЦА, вёска ў Бешанковіцкім р-не Віцебскай вобл., на ўсх. беразе воз. Астровенскае. Цэнтр сельсавета. За 22 км на У ад г.п. Бешанковічы, 39 км ад Віцебска. 51 ж., 34 двары (2001).

СО́РСА (Sorsa) Калеві (н. 21.12.1930, г. Кеўру, Фінляндыя), фінляндскі паліт. і дзярж. дзеяч. Скончыў Вышэйшую школу грамадскіх навук (цяпер ун-т

СОРТ [франц. sorte ад лац. sors (sortis) від, разнавіднасць], 1) тое, што і гатунак (напр., мука вышэйшага С.). 2) Разрад, род, разнавіднасць чаго-н., што валодае пэўнымі адзнакамі якасці і характарызуецца каштоўнымі ўласцівасцямі ў параўнанні з інш. таварам, раслінай і г.д.

СОРТ РАСЛІ́Н, сукупнасць раслін, створаная шляхам *селекцыі раслін*, якія маюць пэўныя спадчынныя марфал., біял., гасп. прыкметы і якасці. Паводле паходжання вылучаюць С.р. м я с ц о в ы я (нар. селекцыі), што ўзніклі ў выніку працяглага масавага адбору пры вырошчванні культуры ў пэўнай мясцовасці, і с е л е к ц ы й н ы я, што выводзяць у н.-д. установах. Паводле генет. і біял. асаблівасцей С.р. падзяляюць на сарты-лініі (ад адной самаапыляльнай расліны метадам *індывідуальнага адбору*), сарты-папуляцыі (атрымліваюць шляхам *масавага адбору* з неаднародных па спадчыне самаапыляльных і перакрыжаванаапыляльных раслін) і сарты-клоны (патомства адной расліны, размножанай вегетатыўна). Гібрыды, атрыманыя скрыжаваннем С.р., характарызуюцца паскораным ростам і развіццём, высокай ураджайнасцю ў 1-м пакаленні (з'ява *гетэрозісу*). Пры працяглым выкарыстанні ў выніку мех. і біял. засмечанасці, распаўсюджвання захворванняў якасці С.р. зніжаюцца. Укараненне новых раянаваных С.р. у вытв-сць (сартазмена) — адзін з эфектыўных сродкаў павышэння ўраджайнасці с.-г. культур і паляпшэння якасці прадукцыі. Гл. таксама *Сартавое раянаванне*, *Сортаабнаўленне*, *Сортавыпрабаванне*.

СОРТААБНАЎЛЕ́ННЕ, перыядычная замена сартавога насення, якасць якога пагоршылася, насеннем таго ж сорту больш высокіх рэпрадукцый. Асн. задачы С. — захаванне каштоўных гасп. і біял. якасцей сорту, пры якіх ён быў раянаваны, аздараўленне насення, захаванне высокай чыстасортнасці, папярэджванне біял. і мех. засмечанасці пасеваў. Для большасці культур С. прадугледжана кожныя 2—5 гадоў.

СОРТАВЫПРАБАВА́ННЕ, вывучэнне і ацэнка новых сартоў і гібрыдаў с.-г. культур і ўстанаўленне іх прыдатнасці для вырошчвання ў вытв. умовах. Гал. задача С. — дакладная параўнальная ацэнка сартоў і гібрыдаў, выяўленне ўстойлівых да хвароб і шкоднікаў, больш ураджайных і каштоўных па гасп.-біял. паказчыках і прыдатных да *сартавога раянавання*. С. раслін праводзяць на дзярж. сортавыпрабавальных участках, сярод якіх вылучаюць комплексныя (выпрабаванне розных культур), спецыялізаваныя (выпрабаванне групы ці асобнай культуры) і агратэхн. (акрамя С., вылучаюць тэхналогіі іх вырошчвання ў адкрытых і ахаваных грунтах). На Беларусі метадычнае кіраўніцтва і каардынацыю С. ажыццяўляе К-т па дзярж. выпрабаванні і ахове сартоў раслін.

СО́РУС (ад грэч. sōros куча), група спорый органаў бясполага размнажэння (*спарангіяў* або *гаметангіяў*), размешчаных скучана на паверхні слаявіны ў чырв. і бурых водарасцей, на лісці ў папарацепадобных, а таксама група пладовых цел у ніжэйшых грыбоў.

СО́РЫН Савелій (люты 1878, г. Полацк Віцебскай вобл. — ліст. 1953), амерыканскі мастак-партрэтыст бел. паходжання. З 1894 вучыўся ў Адэскім маст. вучылішчы ў К.Кастандзі, у Пецярбургскай АМ у І.Рэпіна. Зазнаў уплывы А.Бенуа, А.Матыса, П.Пікасо. З 1917 жыў у Парыжы, з 1923 у Нью-Йорку. У творчасці імкнуўся спалучыць жывапіснасць імпрэсіянізму з веліччу ідэі і выканальніцкім майстэрствам мастакоў Адраджэння. Пісаў пераважна партрэты дзеячаў рас. культуры, у т.л. Бенуа, М.Горкага, Э.Дузе, Г.Паўлавай, М.Фокіна, Ф.Шаляпіна. *Г.М.Ярмоленка.*

СОС (англ. SOS), міжнародны радыёсігнал аб бедстве суднаў ці самалётаў; гл. *Сігнал бедства «SOS»*.

СО́СЕНКА, археалагічныя помнікі каля в. Сосенка Вілейскага р-на Мінскай вобл.: 3 паселішчы і курганны могільнік. Паселішчы адносяцца да эпохі мезаліту і ранняга неаліту (першае, 7—5-е тыс. да н.э.), неаліту (другое і трэцяе, 4-е — канец 3-га тыс. да н.э.). Знойдзены крамянёвыя мікралітычныя ўкладышы, наканечнікі стрэл, скрабкі, разцы, праколкі, нажы, сякеры, абломкі глінянага ляпнога посуду. Курганны могільнік налічваў 23 насыпы (17 круглых і 6 прадаўгаватых), датуецца 8 — пач. 10 ст. Пахавальны абрад — трупаспаленне па-за межамі могільніка (1—3 спаленні ў кожным кургане). Знойдзены бронзавыя ўпрыгожанні, жал. нажы, рыбалоўныя кручкі, матыка, крэсіва, гліняныя праслiцы, шкляныя пацеркі і інш.

СО́СІНА-ІЗРАЙЦЕЛЬ Берта Майсееўна (13.2.1903, г. Чавусы Магілёўскай вобл. — 23.10.1982), бел. вучоны ў галіне рэнтгеналогіі. Д-р мед. н. (1950), праф. (1951). Засл. дз. нав. Беларусі (1967). Скончыла БДУ (1928). З 1934 у Мінскім мед. ін-це. У 1951—77 у Бел. ін-це ўдасканалення ўрачоў (заг. кафедры). Навук. працы па пытаннях функцыян. рэнтгенадыягностыкі пашкоджанняў органаў стрававання і сардэчна-сасудзістай сістэмы.

Тв.: Клиническая рентгенокимография сердца. Мн., 1939 (разам з М.М.Уладысікам); Рентгенодиагностика заболеваний эндокринного аппарата // Основы эндокринологии. 2 изд. Мн., 1967; Рентгенодиагностика хронических неспецифических воспалительных заболеваний легких (разам з І.І.Лазюк, Л.А.Жакавай) // Диагностика хронических заболеваний легких. Мн., 1971.

СО́СНА, возера ў Полацкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Дражбітка (цячэ праз возера), за 30 км на ПнУ ад г. Полацк. Пл. 1,25 км², даўж. 1,7 км, найб. шыр. 900 м, найб. глыб. 6 м, даўж. берагавой лініі 5,5 км. Пл. вадазбору 127 км². Катлавіна складаецца з паўн. і паўд. плёсаў, раздзеленых востравам (пл. 0,8 га). Схілы выш. да 3 м, на Пн і У да 8 м, стромкія, пераважна ўкрытыя лесам. Берагі нізкія, забалочаныя. Зарастае слаба.

СО́СНА, возера ў Віцебскім р-не, у бас. р. Лужасянка, за 18 км на ПнЗ ад г. Віцебск. Пл. 1,1 км², даўж. 2,6 км, найб. шыр. 820 м, найб. глыб. 9,4 м, даўж. берагавой лініі 7,5 км. Пл. вадазбору 5 км². Катлавіна лагчыннага тыпу, востравам у цэнтры (пл. 1,5 га) падзелена на 2 плёсы. Схілы 5—7 м (на ПнУ 10—13 м), на Пн і У разараныя, на З параслі лесам. Берагі пераважна зліваюцца са схіламі, участкамі выш. 0,4—0,7 м, задзернаваныя, на ПдУ забалочаныя, пад хмызняком. Пойма шыр. 5—20 м, на ПдУ пашыраецца да 300 м, забалочаная. Дно да глыб. 3 м (уздоўж усх. берага да 4 м) пясчанае, ніжэй выслана ілам і сапрапелем. Уздоўж берагоў паласа надводнай расліннасці шыр. 2—20 м, радзей да 30 м. Да глыб. 3,2 м растуць ірдзесты, эладэя, гарлачыкі. На ПнУ выцякае ручай у р. Храпаўлянка. Возера ўваходзіць у зону адпачынку Лосвіда.

СО́СНА, возера ў Гарадоцкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Ловаць, за 37 км, на ПнУ ад г. Гарадок. Пл. 1,02 км², даўж. 1,5 км, найб. шыр. 1 км, найб. глыб. 5,1 м, даўж. берагавой лініі 4,1 км. Пл. вадазбору 260 км². Катлавіна тэрмакарставага тыпу. Схілы выш. 2—5 м, месцамі 7 м, параслі хмызняком, на ПдУ разараныя. Берагі нізкія, параслі балотнай расліннасцю і хмызняком. Дно выслана пяском (да глыб. 1—2 м), апясчаненым ілам (да 3—4 м), глыбей сапрапелем. Уздоўж берагоў перарывістая паласа надводнай расліннасці шыр. да 8 м, пашырана да глыб. 0,7 м; да глыб. 1,5 м растуць ірдзесты. Ловаць цячэ праз возера і злучае яго з воз. Мяжа.

СО́СНА, Міхалова, возера ў Шумілінскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Зах. Дзвіна, за 14 км на ПдУ ад г.п. Шумілiна. Пл. 0,71 км², даўж. 1,3 км, найб. шыр. 960 м, найб. глыб. 22,9 м, даўж. берагавой лініі 4,8 км. Пл. вадазбору 3,8 км². Катлавіна эварзійнага тыпу. Схілы выш. 12 м (на Пн і У 3—5 м), параслі хмызняком. Ёсць некалькі заліваў і мысаў, 3 астравы агульнай пл. 1,2 га. Берагі нізкія, на З і ПнУ зліваюцца са схіламі. Дно складанай будовы (упадзіны чаргуюцца з падняццямі), да глыб. 2—5 м пясчанае, глыбей ілістае. Найб. зарастае ў залівах і вакол астравоў, шыр. паласы расліннасці 20—170 м. У возеры рэдкія расліны — гідрыла кальчаковая і наяда марская. Злучана ручаём з воз. Гародна. Возера і прылеглая тэрыторыя ўваходзяць у заказнік *Сосна*.

СО́СНА, Лешна, возера ў Полацкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Сосніца (выцякае з возера), за 30 км на ПнУ ад г. Полацк. Пл. 0,68 км², даўж. 1,3 км, найб. шыр. 820 м, найб. глыб. 6 м, даўж. берагавой лініі 3,7 км. Пл. вадазбору 93 км². Катлавіна складанага тыпу. Схілы выш. 3—4 м (на У да 20 м), пясчаныя. Ёсць некалькі заліваў. Упадае р. Невежа.

СО́СНА, возера ў Сенненскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Бярозка, за 18 км на Пн ад г. Сянно. Пл. 0,54 км², даўж. 2,7 км, найб. шыр. 340 м, найб. глыб. 8,2 м, даўж. берагавой лініі 6,3 км. Пл. вадазбору 7,21 км². Катлавіна лагчыннага тыпу. Схілы на ПнУ выш. да 20 м (на ПдЗ 2—5 м), пераважна пад хмызняком. Берагі нізкія, забалочаныя, на ПнУ зліваюцца са схіламі. Уздоўж паўд.-зах. берага забалочаная пойма шыр. 150—250 м, паслая хмызняком. Дно да глыб. 2—3 м пясчанае, глыбей ілістае. Зарастае да глыб. 3 м, шыр. паласы расліннасці 15—75 м.

СО́СНА, гідралагічны заказнік рэсп. значэння ў Шумілінскім р-не Віцебскай вобл. Засн. ў 1979 для аховы воз. *Сосна* і прылеглых прыродных комплексаў. Пл. 451 га. Рэльеф дробна- і сярэднеўзгорысты, складзены з марэнных суглінкаў і супескаў, схілы выш. да 12 м, у асн. с.-г. ўгоддзі. Лясы займаюць каля 16% плошчы, пераважаюць яловыя, бярозавыя, асінавыя. У возеры выяўлены рэдкія расліны, занесеныя ў Чырв. кнігу: гідрыла кальчаковая і наяда марская.

П.І.Лабанок.

СО́СНІЦА, рака ў Полацкім р-не Віцебскай вобл., правы прыток р. Зах. Дзвіна. Даўж. 39 км. Пл. вадазбору 394 км². Выцякае з воз. Сосна за 10 км на ПдЗ ад в. Труды, вусце каля в. Сосніца. Цячэ па Полацкай нізіне. Даліна невыразная. Рэчышча звілістае, шыр. ў вярхоўі 3—5 м, у ніжнім цячэнні 7—9 м.

СО́СНІЦА, назва р. *Выдрыца* (бас. р. Дняпро) у верхнім цячэнні.

СО́СНІЦКАЯ КУЛЬТУ́РА, археалагічная культура сярэдняга перыяду бронзавага веку (15—9 ст. да н.э.) у бас. Верхняга Дняпра, Ніжняй Прыпяці і Дзясны; сосніцкі варыянт усходнетшцінецкай культуры. Назва ад г.п. Сосніца ў Чарнігаўскай вобл. (Украіна). Вылучана ў самаст. культуру ў 1961 І.І.Арцёменкам. Паселішчы С.к. размяшчаліся на поймавых узвышшах, мысах, астанцах і па краях тэрас. Жытлы наземныя ці заглыбленыя ў зямлю, слупавой канструкцыі, часцей з жылым і гасп. памяшканнямі, з печамі, адкрытымі агнішчамі і гасп. ямамі. Пахавальны абрад — трупаспаленне і трупапалажэнне, адпаведна ў грунтавых і курганных могільніках. Насельніцтва займалася земляробствам, жывёлагадоўляй, паляваннем, рыбалоўствам, а таксама бронзаліцейнай вытворчасцю. Сярод посуду пераважаюць гаршкі, міскі, слоікападобныя пасудзіны. Арнамент складаўся з адбіткаў шнура, зубчастага штампа, перавітай вяровачкі, ружанцовага ўзору, перакрэсленых ліній, наляпаных валікаў. Вырабы з бронзы прадстаўлены нажамі, кельтамі, долатамі, наканечнікамі дзідаў, упрыгожаннямі. На Беларусі матэрыялы С.к. выяўлены на помніках *Мохаў* Лоеўскага р-на і *Ходасавічы* Рагачоўскага р-на Гомельскай вобл.

СО́СНЫ, вёска ў Любанскім р-не Мінскай вобл., на аўтадарозе Любань — Камаровічы. Цэнтр сельсавета і эксперым. базы «Любанская». За 25 км на ПдУ ад г. Любань, 177 км ад Мінска, 50 км ад чыг. ст. Урэчча. 772 ж., 320 двароў (2001). Участак раённых электрасетак. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, амбулаторыя, аптэка, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

«СО́СНЫ», акадэмічны навукова-тэхнічны комплекс. Створаны ў 1993 у пас. Сосны пад Мінскам. У склад яго ўвайшлі *Інстытут праблем энергетыкі, Інстытут радыеэкалагічных праблем, Інстытут радыяцыйных фізіка-хімічных праблем*, доследна-канструктарскае бю-

ро «Акадэмічнае», Інжынерна-тэхн. прадпрыемства «ІТЦ-Сосны». У 2001 перайменаваны ў «Цэнтр ядзерных тэхналогій — Сосны Нац. АН Беларусі».

СО́ТАВАЯ РАДЫЁСУВЯЗЬ, бесправадная перадача інфармацыі паміж рухомымі абанентамі, якія знаходзяцца ў зоне абслугоўвання, а таксама паміж імі і абанентамі стацыянарнай тэлеф. сеткі.



Схема тэрытарыяльна-частотнага планавання **сотавай радыёсувязі** з рухомымі аб'ектамі: D — ахоўны інтэрвал; R — радыус ячэйкі; R_0 — радыус зоны абслугоўвання; ЦС — цэнтральная станцыя камутацыйнай сістэмы; Бс — базавая станцыя; аднолькавым колерам вылучаны ячэйкі з аднолькавымі рабочымі частотамі.

Зона абслугоўвання падзяляецца на ячэйкі малога радыуса (да 30 км), падобныя на пчаліныя соты (адсюль назва), і кожная з іх мае базавую станцыю (БС) з пэўнай колькасцю модуляў прыёмна-перадавальнага абсталявання.

Кожнай БС выдзяляюцца пэўныя частоты для *радыёсувязі*, пры гэтым для выключэння ўзаемных перашкод аднолькавыя частоты маюць прасторава аддаленыя адна ад адной БС. Сувязь паміж абанентамі адной соты ажыццяўляецца з дапамогай БС, а паміж абанентамі розных сотаў, у т.л. пры перамяшчэнні абанента з адной соты ў другую, а таксама з абанентамі стацыянарнай тэлеф. сувязі — з дапамогай цэнтра камутацыі рухомай сувязі. Сістэма С.р. з лічбавымі метадамі перадачы сігналаў забяспечвае ахову паведамленняў ад несанкцыяніраванага доступу, устойлівасць і высокую якасць сувязі, перадачу даных і інш. паслугі сувязі, у т.л. доступ да сістэм С.р. аднолькавага стандарту розных краін.

Э.Б.Ліпковіч.

СО́ТНІ, 1) карпаратыўныя арг-цыі *купецтва* ў 12—18 ст. у Стараж. Русі, ВКЛ (да 15—16 ст.) і Рас. дзяржаве. У 12—15 ст. існавалі ў Кіеве, Ноўгарадзе, Полацку, Віцебску, Маскве і інш. гарадах. У 16—17 ст. купецкія вярхі Расіі аб'ядноўваліся ў 3 С.: гасцей (гл. *Госць*), гасціную і суконную. З узвядзеннем *гільдый* (1719—22) купецкія С. Расіі ліквідаваны. 2) Аб'яднанні гандл.-рамеснага насельніцтва, падобныя да еўрап. *цэхаў*, якія ўтвараліся паводле праф.-тэр. прынцыпу (кавальскія, ганчарскія і інш.) у гарадах 11—18 ст. Стараж. Русі, ВКЛ і Рас. дзяржавы. Узначальваліся выбарнымі *сотнікамі*; мелі права самакіравання, плацілі падаткі, выконвалі розныя феад. павіннасці, удзельнічалі ў гар. апалчэнні. З канца 15 ст. паступова ператварыліся ў адм.-тэр. адзінкі. На Беларусі С. працягвалі існаваць і ў гарадах з *магдэбургскім правам*. У Расіі гар. С. ліквідаваны з увядзеннем цэхавай арг-цыі (1722), на Беларусі — пасля яе далучэння да Расіі (1772—95).

СО́ТНІК, 1) асоба, якая ўзначальвала *сотню* ў войску Кіеўскай Русі 9—11 ст. і інш. княствах усх. славян, а таксама ў стралецкім войску Рас. дзяржавы ў 16—17 ст. 2) Службовая асоба гар. самакіравання Беларусі ў 16—18 ст., якая ўзначальвала сотню. С. выбіраўся з заможных мяшчан і падпарадкоўваўся войту. Сачыў, у т.л. праз падначаленых яму дзесятнікаў, за выкананнем мяшчанамі павіннасцей, выплатай падаткаў і інш. С. абавязаны быў з'яўляцца на чале сотні на замкавыя работы і для абароны замка ад непрыяцеля; прымаў удзел у пасяджэннях гар. *рады*, хоць не ўваходзіў у склад магістрата, без згоды С. войт не меў права прымаць важныя рашэнні. 3) Нач. адм.-тэр. сотні на Украіне ў 16—18 ст. Меў шырокія ваен., адм., суд. і фін. паўнамоцтвы. Напачатку выбіраўся казакамі, пазней прызначаўся *гетманам* ці *палкоўнікамі* з ліку *старшыны*, пасля 1764 — прэзідэнтам маларасійскай калегіі. Пасля ліквідацыі аўтаномнасці (1765—80) пасада С. скасавана. 4) Воінскае званне ў рэестравым казацкім войску (частка ўкр. казацкага войска, якое знаходзілася ў 16—17 ст. на ваен. службе ў Рэчы Паспалітай і было ўнесена ў асобы спіс-рэестр). 5) Обер-афіцэрскі чын у казацкіх войсках Рас. імперыі, адпавядаў чыну паручніка ў рэгулярных войсках.

СО́ТНІКАЎ Сяргей Трыфанавіч (18.11.1920, в. Батунь Магілёўскага р-на — 31.7.2000), поўны кавалер ордэна Славы. У Вял. Айч. вайну з канца 1943 да ліп. 1944 у партызанах, потым на фронце. Санінструктар мал. сяржант С. вызначыўся ў баях на тэр. Польшчы і Германіі: знішчыў 24, узяў у палон 18 гітлераўцаў, вынес з поля бою 75 параненых. Да 1980 працаваў у нар. гаспадарцы.

СО́ТНЯ, 1) грамадская і ваенная арг-цыя ў германцаў і шэрагу інш. народаў Еўропы ў перыяд пераходу ад першабытнаабшчыннага ладу да феадалізму. Нар. сходы С. пад старшынствам выбарнага *сотніка* вырашалі адм., суд. і інш. пытанні, з пачаткам вайны вылучалі пэўныя сілы і сродкі для апалчэння. У краінах кантынент. Еўропы зніклі ў працэсе феадалізацыі; у Англіі паступова падпарадкаваны каралеўскай уладзе ў асобе яе прадстаўніка і ў якасці адм.-тэр. адзінкі (некалькі С. складалі графства) з абмежаванымі адм.-паліцэйскімі функцыямі захоўваліся да канца 19 ст. 2) Вайсковае падраздзяленне, арганізац. і баявая адзінка, якая звычайна налічвала 100 чал. У войску Кіеўскай Русі і шэрагу інш. княстваў, у т.л. на Беларусі, С. ствараліся з гар. і сельскага апалчэння. У рус. *раці* С. дзейнічалі ў складзе *палка* або самастойна. У 16—17 ст. С. складалі полк стралецкага войска. У казацкіх палках Рас. імперыі конная С. колькасна адпавядала *эскадрону* рэгулярнай кавалерыі, пешая — пяхотнай *роце*. 3) Частка гарадской абшчыны ў феад. Беларусі, вылучаная з вайск. і фіскальнымі мэтамі. Соценны падзел у гарадах Беларусі адпавядаў вечавой арг-цыі гар. самакіравання ў дамангольскі перыяд. У ліку гал. абавязкаў членаў С. былі работы на замкавых аб'ектах і іх абарона ад нападаў праціўніка. Соценны падзел у некат. гарадах Беларусі існаваў да пач. 18 ст. 4) Адм.-тэр. і вайск. адзінка на Украіне ў 16—18 ст. Узнікла ў сувязі з утварэннем войска рэестравых казакоў і складала частку палка. У 1648—54 палкавое і соценнае ўладкаванне пашырылася на ўсю Украіну. З зацвярджэннем у 1781 палажэння аб губернях С. як адм.-тэр. адзінка скасавана. 5) Саслоўна-карпаратыўная арганізацыя *купецтва* і гандлёва-рамеснага насельніцтва на тэр. Стараж. Русі, Расіі, Украіны, Беларусі і інш. ў 11—18 ст. (гл. *Сотні*).

СО́УС у графіцы, 1) матэрыял для малявання ў выглядзе палачак у абгортцы, якія складаюцца з вельмі дробнага і мяккага парашку сажы з дамешкам кляёў. 2) Тэхніка малявання, пры якой парашкападобны С. наносяць тампонам або палачкай з конусападобным канцом (растушоўка). Часам дэталі прапрацоўваюць італ. алоўкам. Існуе таксама тэхніка выканання малюнка пэндзлем, растворам С. ў вадзе (мокры С.), што не патрабуе наступнага замацавання фіксатывамі.

СО́ЎКА-СПЛЮ́ШКА, птушка сям. савіных, гл. *Сплюшка*.

СО́ЎКІ, начніцы (Noctuidae), сямейства матылёў. Больш за 30 тыс. відаў; пашыраны паўсюдна. На Беларусі каля 300 відаў. Начныя жывёлы, дарослыя жывяцца нектарам кветак, сокам раслін. Шкоднікі культ. раслін: *азімая соўка*, клічная, выдатная, гарохавая, агародная, капусная, лугавая, хваёвая, С.-гама, С.-коска, зерневая, баваўняная і інш. Вылучаюць С. падгрызаючых (вусені жывуць у паверхневым слоі глебы, падгрызаюць расліны каля каранёвай шыйкі) і лісцегрызучых (вусені жывуць на раслінах, кормяцца надземнымі ч. раслін).

Размах крылаў 1—11 см. Цела масіўнае, шчыльна ўкрытае валаскамі. Агульная афарбоўка цёмная, пярэднія крылы вузкія з характэрным малюнкам (3 плямы), заднія белаватыя ці шараватыя, цямнейшыя па вонкавым краі. У С. добра развіта *мімікрыя* (колер і малюнак крылаў адпавядаюць колеру паверхні, на якой яны сядзяць). Вельмі пладавітыя. Вусені шаравата-бурыя, карычневыя або зялёныя з прадаўгаватымі палоскамі, пераважна голыя. Кукалка жаўтавата-бурая, карычневая, без кокана, звычайна ў глебе.

СО́ЎПЕЛЬ Ігар Васілевіч (н. 8.4.1949, в. Гарадзец Кобрынскага р-на Брэсцкай вобл.), бел. вучоны ў галіне тэхн. кібернетыкі і інфарматыкі. Д-р тэхн. н. (1992), праф. (1994). Скончыў БДУ (1971), дзе працуе з 1979 (з 1997 заг. кафедры). Навук. працы па стварэнні інтэлектуальных інфарм. сістэм, лінгвістычных баз ведаў, семантычным аналізе тэксту. Распрацаваў прынцыпы, метады і алгарытмы ўзнаўляльнага мадэліравання лінгвістычных аб'ектаў і працэсаў, стварыў кампʼютэрную сістэму бел.-рус. і рус.-бел. машыннага перакладу тэкстаў.

Тв.: Инженерно-лингвистические принципы, методы и алгоритмы автоматической переработки текста. Мн., 1991; Development and application of corpus of virtual texts in MM-system // Вестн. БГУ. Сер. 1. 1996. №3.

СО́ФТБОЛ (англ. softball літар. — мяккі мяч), спартыўная камандная гульня з мячом; разнавіднасць *бейсбола*. 2 варыянты: т. зв. «фаст-піч» і «слоў-піч». Каманда складаецца з 9 — 10 гульцоў. Гуляюць на ромбападобным корце з даўж. бакоў 18,3—19,8 м. Інвентар: драўляная або метал. біта даўж. 86,5 см; мяч (з расл. пуху або сінт. матэрыялаў) дыяметрам 9,5 см, пальчаткі, ахоўныя маскі, камізэлькі.

Узнік у Ірландыі ў сярэднія вякі. У сучасным выглядзе склаўся ў ЗША у канцы 19 — пач. 20 ст. Міжнар. федэрацыя С. заснавана ў 1952. Чэмпіянаты свету для мужчын і жанчын праводзяцца з 1965 раз у 2 гады. Найб. пашыраны ў Аўстраліі, ЗША, Канадзе, Кубе, Мексіцы, Японіі і інш.

СО́ФʼЯ АЛЯКСЕ́ЕЎНА (27.9.1657, Масква — 14.7.1704), правіцельніца Расіі ў 1682—89. Дачка цара *Аляксея Міхайлавіча* ад першага шлюбу. Вызначалася розумам і энергіяй, была адукаванай жанчынай (выхаванка *Сімяона Полацкага*). Абвешчана рэгенткай пры двух царах — яе малалетніх братах *Іване V* і *Пятру I* у час інспіраванага яе прыхільнікамі *Маскоўскага паўстання 1682*. Апіралася на кн. В.В.Галіцына і думнага дзяка Ф.Л.Шаклавітага. Пры ёй аблегчана становішча пасадскіх людзей, паслаблены вышук збеглых сялян, заключаны «*Вечны мір*» *1686* з Рэччу Паспалітай і *Нерчынскі дагавор 1689*, праведзены малаўдалыя паходы 1687 і 1689 супраць Крымскага ханства. Скінута Пятром I і зняволена ў Новадзявочым манастыры. Пасля паражэння ўзнятага яе прыхільнікамі стралецкага паўстання 1698 пастрыжана ў манашкі.

СО́ФʼЯ ВІТАЎТАЎНА (каля 1371—5.7.1453), вялікая княгіня маскоўская. Дачка вял. кн. ВКЛ *Вітаўта* і яго 2-й жонкі смаленскай князёўны Ганны Святаслаўны, жонка (з 1391) маскоўскага вял. кн. *Васіля I* [1398—1425], маці *Васіля II* [1425—62]. Дзякуючы яе шлюбу паміж ВКЛ і Масквой усталяваліся працяглыя мірныя адносіны. У гады малалецтва Васіля II (н. 1415) і пазней энергічная і смелая С.В.фактычна ўзначальвала маскоўскі ўрад, вяла ўзбр. барацьбу з прэтэндэнтамі на трон Юрыем Дзмітрыевічам (братам Васіля I), яго сынамі Дзмітрыем Шамякам і Васілём Касавокім. Двойчы (1433, 1446) зняволена паліт. праціўнікамі. Удзельнічала ў абароне Масквы ад татар (1451). Перад смерцю прыняла манаства.

СО́ФʼЯ ГАЛЬША́НСКАЯ, Соф'я Друцкая (па маці; 1405?—21.9.1461), польская каралева, жонка *Ягайлы*. Дачка кн. Андрэя Гальшанскага (Вязынскага) і Аляксандры Дзмітрыеўны Друцкай. Выхоўвалася ў Друцку ў дзядзькі Сямёна Друцкага. 24.3.1422 выйшла замуж за Ягайлу, каранавана ў Кракаве 12.2.1424. Нарадзіла 3 сыноў: Уладзіслава, караля Польшчы і Венгрыі (гл. *Уладзіслаў III*), Казіміра (памёр у дзяцінстве), Казіміра, вял. князя ВКЛ і караля Польшчы (гл. *Казімір IV*). Адыгрывала значную ролю ў паліт. жыцці Польшчы, вяла барацьбу за кароны для сваіх сыноў. У час панавання Казіміра была яго дарадцам. Непрыязна ставілася да інкарпарацыі ВКЛ у Польшчу, падтрымлівала гусіцкі рух. Вызначалася талерантнасцю, не парывала сувязей з літ.-бел. асяроддзем (пры яе двары знаходзілася правасл. шляхта). Пахавана ў Кракаве ў Вавельскім кафедральным касцёле ў капліцы св. Тройцы.

Літ.: Bogucka M. Kazimierz Jagiellończyk i jego czasy. Warszawa, 1981; Rudzki E. Polskie królowie. T. 1. Żony Piastów i Jagiellonów. 2 wyd. Warszawa, 1990. *Л.П.Собалева.*

СО́ФʼЯ СЛУ́ЦКАЯ (1.5.1585, г. Слуцк — 19.3.1612), рэлігійная дзеячка, бел. правасл. святая. Дачка слуцкага кн. Юрыя Алелькавіча і Барбары Кішкі. Выхоўвалася ў праваслаўі. Рана асірацела і стала ўладальніцай вял. латыфундыі пад апекай сваякоў Хадкевічаў. Пасля смерці дзядзькоў Аляксандра (1591) і Яна Сымона (1592) да Соф'і адышло ўсё *Слуцкае княства* з гарадамі Слуцк і Капыль, мяст. Раманава, Старобін, Любань, Пясочнае і Ленін, 32 фальваркі. Яе апекуны Хадкевічы завінавацілася Радзівілам вял. суму грошай, і ў 1600 дамовіліся выдаць Соф'ю замуж за Я.Радзівіла (у будучым кашталян віленскі). Аднак спрэчкі паміж Хадкевічамі і Радзівіламі ледзь не выліліся ў баявыя дзеянні. Пры пасрэдніцтве караля Жыгімонта III Вазы бакі паразумеліся. 1.10.1600 у Брэсце адбыўся шлюб Соф'і з Радзівілам. Хоць муж вызнаваў кальвінізм, Соф'я засталася праваслаўнай. Шмат увагі аддавала дабрачынным справам, падтрымлівала правасл. цэрквы і манастыры ў Слуцкім княстве, якое дзякуючы ёй захавала сваё правасл. аблічча. Пасля яе заўчаснай смерці Слуцкае княства, згодна з ранейшай дамоўленасцю, перайшло да Радзівілаў. Труна з астанкамі Соф'і знаходзілася ў царкве *Слуцкага Троіцкага манастыра* і шанавалася як цудатворная. Зараз мошчы зберагаюцца ў Мінскім Свята-Духавым кафедральным саборы, Соф'я ўваходзіць у Сабор бел. святых. Дзень яе памяці 1 красавіка.

Літ.: Грицкевич А.П. Древний город на Случи. Мн., 1985; Мельников А.А. Путь непечален. Мн., 1992. *А.П.Грыцкевіч.*

«СОЦИАЛІ́СТ-РЕВОЛЮЦИОНЕ́Р», газета Мінскага абл. к-та партыі *сацыялістаў-рэвалюцыянераў* (эсэраў). Выходзіла з 23.10 да 19.12.1917 у Мінску на рус. мове штодзённа. Прытрымлівалася правай плыні партыі эсэраў. Змяшчала звароты ЦК, артыкулы парт. дзеячаў, перадрукоўкі з газ. «Дело народа», паведамляла пра парт. рух сярод вайскоўцаў. Друкавала адозвы А.Ф.Керанскага, ЦК і фракцыі эсэраў, 2-га Усерас. з'езда Саветаў, К-та выратавання рэвалюцыі Зах. фронту і інш. Выступала ў абарону дэмакр. свабод, за наданне паўна-



Соўкі і іх вусені: 1 — капусная; 2 — звычайная зерневая; 3 — паўднёвая сцябловая; 4 — бавоўнавая; 5 — соўка-гама.

моцтваў Устаноўчаму сходу ў вырашэнні праблем рас. грамадства, у падтрымку дзяржаўнасці Беларусі, земскага і гар. самакіравання, салдацкіх, сял. і рабочых арг-цый. Змяшчала матэрыялы пра дзейнасць у Мінску 2-га франтавога, 3-га сял., Усебел. і інш. з'ездаў, справаздачы аб пасяджэннях Аблвыкамзаха, паведамленні на тэмы агульнарас. і бел. жыцця, нарысы, вершы. Закрыта 19 снеж. загадам СНК Зах. вобласці і фронту. Выйшла 48 нумароў.

М.Я.Сяменчык.

СО́ЦКІ, 1) старшы над сотняй у апалчэнні Кіеўскай Русі і стараж.-рус. княствах. 2) Староста ў Рус. дзяржаве 15—17 ст. 3) У Рас. імперыі, у т.л. на Беларусі, выбарная службовая асоба ад гар. пасадскага насельніцтва, *дзяржаўных сялян* (канец 18 ст. — 1861 і ўсіх катэгорый сялян пасля *сялянскай рэформы 1861*. Афіц. пасада С. ўведзена ў 1837 як найбліжэйшага выканаўцы распараджэнняў *станавога прыстава*. С. штогод выбіраўся на сельскім сходзе з членаў сельскай грамады — адзін ад 100—200 двароў. З 1861 падпарадкоўваліся *старшыне валасному* і *старасту сельскаму*, з 1878 — паліцэйскаму *ўрадніку*. У канцы 1880-х г. у 46 губернях еўрап. ч. Расіі было 59 тыс. С., у т.л. ў 5 зах. губернях — 4,5 тыс. С. выконвалі і грамадскія, і паліцэйскія абавязкі. З 1903 С. заменены вольнанаёмнымі павятовымі *стражнікамі*. 4) Маладыя служыцелі для даручэнняў, пераважна ў ратушах Левабярэжнай і Правабярэжнай Украіны і зах.-ўкр. зямель у 17—18 ст.; у некат. мясцовасцях іх наз. сотнічкамі, есаўльчыкамі.

В.П.Панюціч.

СО́ЦКІ Барыс Аляксандравіч (23.4.1930, г. Саратаў, Расія — 10.3.1995), бел. фізік-тэарэтык. Д-р фіз.-матэм. н. (1989), праф. (1991). Скончыў БДУ (1953). З 1959 у Ін-це фізікі АН Беларусі (у 1976—93 заг. лабараторыі). Навук. працы па малекулярнай оптыцы і лазернай фізіцы. Распрацаваў паслядоўную малекулярную тэорыю эл.-магн. хваль у крышталях. Заклаў асновы квантавастат. тэорыі аптычных палёў, вызначыў сувязь паміж кагерэнтнасцю і энтрапіяй эл.-магн. выпрамянення.

Тв.: К молекулярной теории отражения и преломления света (разам з Ф.І.Фёдаравым) // Оптика и спектроскопия. 1958. Т. 4, вып. 3; Т.5, вып. 1; Когерентные свойства оптических полей с антикорреляцией в высших порядках (разам з У.А. Дзмітрыевым) // Там жа. 1988. Т. 64, №1.

А.І.Болсун.

СО́ЦЫН, Сацыні (Socyn, Socinus Sozzini) Фауст (5.12.1539, г. Сіена, Італія — 3.3.1604), італьянскі тэолаг-антытрынітарый, філосаф, заснавальнік *сацыніянства*. Скончыў ф-т права ў г. Ліён. Служыў сакратаром пры двары фларэнційскага князя Казіма I Медычы. З 1574 займаўся рэфарматарскай дзейнасцю (гл. *Рэфармацыя*) у тагачасным цэнтры рэліг. вальнадумства г. Базель. З 1579 у Кракаве, актыўна ўключыўся ў радыкальна-рэфармацыйны рух Польшчы і ВКЛ. З 1588, калі на сінодзе ў Брэсце прыхільнікі С. атрымалі ідэйную перамогу, ён стаў ідэолагам польскага і бел. антытрынітарызму. У ідэйнай спрэчцы права і левага крыла *антытрынітарыяў* займаў цэнтрысцкія пазіцыі. Успрыняў і развіў некат. сац. і рэліг.-філас. ідэі С.*Буднага*, але асуджаў яго вучэнне пра натуральнае паходжанне Ісуса Хрыста і выступаў супраць атэіст. тэндэнцый у антытрынітарызме. Вырашальным крытэрыем у ацэнцы Біблії лічыў індывідуальны чалавечы розум. Сцвярджаў, што чалавек валодае свабоднай воляй, якая кіруе розумам і мараллю. Таму ва ўратаванні чалавека вызначальную ролю адыгрываюць не царк. прадпісанні, а свабодны выбар. Антрапалагічнаму песімізму *кальвінізму* проціпаставіў гуманістычны аптымізм, заснаваны на веры, што кожны чалавек здольны заслужыць уратаванне пры дапамозе індывідуальных духоўна-маральных намаганняў.

Літ.: Подокшин С.А. Реформация и общественная мысль Белоруссии и Литвы: (Вторая половина XVI — начало XVII в.). Мн., 1970; Яго ж. Філасофская думка эпохі Адраджэння ў Беларусі: Ад Францыска Скарыны да Сімяона Полацкага. Мн., 1990.

С.А.Падокшын.

СО́ЧЫ, горад у Краснадарскім краі Расіі, прыморскі бальнеакліматычны курорт усерасійскага значэння. Цягнецца ўздоўж Чарнаморскага ўзбярэжжа на 145 км, пл. больш за 3,5 тыс. км^2. Засн. ў 1838. 359 тыс. ж. (2000). Марскі пасажырскі порт, аэрапорт Адлер. Прам-сць абслугоўвае патрэбы курорта. Вядучыя яе галіны — харч., харчасмакавая, буд. прадпрыемствы. Ін-т курортнай справы і турызму. Тэатр. Цырк. Музеі: гісторыі горада-курорта, маст., этнагр. і інш. Месца правядзення розных муз. і кінафестываляў, конкурсаў, спарт. спаборніцтваў. Буйны цэнтр турызму.

Клімат субтрапічны вільготны. Лета сухое і цёплае (сярэдняя т-ра каля 23°С), зіма мяккая. Каля 290 сонечных дзён у годзе. Асн. прыродныя лек. фактары (акрамя клімату): сульфідныя хларыдна-натрыевыя воды Мацэсты (для ваннаў, інгаляцый і інш.), вуглякіслыя мінер. воды Краснай Паляны, таксама ёдабромныя і інш. мінер. воды, высакаякасныя глеістыя гразі (Адлерскі р-н), марскія купанні (з мая па кастр.). Багатая расліннасць: кактусы, кіпарысы, магноліі, пальмы і інш., дэндрарый. Лечаць захворванні органаў кровазвароту, руху і апоры цэнтр. і перыферычнай нерв. сістэмы, скуры, гінекалагічныя (Мацэста); органаў дыхання (нетуберкулёзныя) і функцыян. расстройствы нерв. сістэмы (Адлер, Лазараўскае). Шматлікія санаторыі, пансіянаты, курортныя паліклінікі, турбазы.

СО́ШНА, вёска ў Пінскім р-не Брэсцкай вобл., на аўтадарозе Пінск — Лунінец. Цэнтр сельсавета. За 23 км на ПнУ ад г. Пінск, 198 км ад Брэста, 4 км ад чыг. ст. Парахонск. 750 ж., 272 двары (2001). Лясніцтва. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Царква св. Вольгі. Малітоўны дом евангельскіх хрысціян. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Каля вёскі 2 паселішчы эпохі мезаліту, бронзавага веку і пазнейшай пары.

СО́ШНАЕ ПІСЬМО́, апісанне зямельных уладанняў у гарадах і сельскіх мясцовасцях для пазямельнага абкладання ў Расіі 15—17 ст. Прадугледжвала вымярэнне зямельных плошчаў (у гарадах — забудаваных дварамі), перавод атрыманых звестак ва ўмоўныя падатковыя адзінкі — сохі (гл. *Саха*) і вызначэнне на гэтай аснове памеру прамых падаткаў — т.зв. *пасошнага*. Тэхніка С.п. (ажыццяўлялася спец. пісцом з падначаленымі яму пад'ячымі) змянялася ў адпаведнасці са зменай паняцця «саха» і набыла ўстойлівыя формы ў 16—17 ст. у кнігах сошнага пісьма. Поўныя апісанні гарадоў і паветаў з іх насельніцтвам, дварамі і катэгорыямі землеўладання складалі *пісцовыя кнігі*. У 1646 адзінкай для вылічэння пасошнага стаў двор і замест пісцовых кніг пачалі складаць *перапісныя кнігі*, якія ўтрымлівалі толькі перапіс двароў і іх насельніцтва, а ў 1679 двор стаў і адзінкай падаткаабкладання (гл. *Падворнае абкладанне*).

СО́Я (Glycine), род кветкавых раслін сям. бабовых. Каля 10 відаў. Пашыраны ў вільготных тропіках і субтропіках Афрыкі і Паўд.-Усх. Азіі. Радзіма — Кітай.



Сочы. Дагамыс, гасцініца «Алімпійская».

У Еўропе — з канца 18 ст. С. культурная (G. max). У многіх земляробчых рэгіёнах свету (асабліва ў Паўн. Амерыцы і Усх. Азіі) — адна з асн. зернебабовых, кармавых і тэхн. культур. На Беларусі культывуюць яе ранняспелыя сарты.



Соя звычайная.

Аднагадовыя прамастойныя, павойныя ці паўзучыя травяністыя расліны выш. 20—100 см. Сцёблы звычайна апушаныя цвёрдымі валаскамі. Трайчастае лісце чаргаванае, з прылісткамі. Кветкі дробныя, фіялетавыя, ліловыя, белыя ці чырванаватыя ў пазушных гронках. Плод — струк. У зярнятах С. культурнай 35—50% бялку, блізкага па амінакіслотным саставе да жывёльнага, і 13—24% алею. Іх выкарыстоўваюць у хлебапякарнай, кандытарскай, маргарынавай, мясной і інш. галінах прам-сці. Харч., кармавыя і тэхн. расліны. *А.М.Скуратовіч.*

СПА (Spa), горад на У Бельгіі, у паўн. перадгор'ях Ардэнаў. Каля 10 тыс. ж. (2000). Аэрапорт. Бальнеагразевы курорт. З-д мінер. вады. Раманскі касцёл Сен-Рэмакль, інш. арх. помнікі 17 ст.

СПАБО́РНАСЦЬ с у д о в а я , гл. ў арт. *Судаводства.*

СПАВЯДА́ЛЬНЯ, к а н ф е с і я н а л ь, элемент касцельнага начыння, прызначаны для здзяйснення хрысц. таінства — *споведзі* (пакаяння). Уведзена ў хрысц. абраднасць у 2-й пал. 16 ст. Уяўляе сабой крэсла, закрытае з усіх бакоў невысокімі (да пояса чалавека) дзверцамі. Да бакавых сценак далучаюцца нізкія лаўкі-прыступкі для вернікаў, якія спавядаюцца праз акенцы, закрытыя кратамі. Звычайна С. робяць з дрэва, часам — з мармуру ці стука. У храмах С. размяшчаецца адвольна, але часцей каля сцяны нефа насупраць амбона.

СПАДАРО́ЖНІК, 1) чалавек, які разам з кім-н. знаходзіцца ў дарозе; таксама той, хто разам ідзе па жыццёвай дарозе. 2) Тое, што непарыўна звязана з чым.-н., спадарожнічае чаму-н. (напр., вільготнае надвор'е — С. інфекцыйных захворванняў). 3) Нябеснае цела, якое рухаецца вакол планеты (гл. *Спадарожнікі планет*), зоркі. 4) Штучны апарат, які запускаецца ў космас з навук. і інш. мэтамі (гл. *Штучны спадарожнік Зямлі*).

СПАДАРО́ЖНІК СУ́ВЯЗІ, спадарожнік Зямлі для *рэтрансляцыі* сігналаў адраснай сувязі са стацыянарнымі ці перасоўнымі наземнымі радыёстанцыямі. Запускаецца на высокаэліптычныя, нізкія, сярэдневышынныя ці геастацыянарныя арбіты (гл. *Штучны спадарожнік Зямлі*).

Мае бартавы рэтранслятар, прыёмныя і перадавальныя антэны, сістэмы сілкавання, арыентацыі антэн і сонечных батарэй, пастаравай стабілізацыі і карэкцыі месцазнаходжання спадарожніка на арбіце, тэрмастабілізацыі і інш. Для кіравання функцыямі сістэм С.с. выкарыстоўваецца камандная радыёлінія; кантроль за станам абсталявання ажыццяўляецца па тэлеметрычным канале.

СПАДАРО́ЖНІКАВАЯ РАДЫЁСУ́ВЯЗЬ, сувязь паміж наземнымі радыёстанцыямі з дапамогай *рэтрансляцыі* сігналаў адным ці больш ШСЗ; адзін з відаў *радыёсувязі*.

Вызначаецца адначасовым доступам да *спадарожніка сувязі* вял. колькасці наземных радыёстанцый, якія знаходзяцца ў зоне яго радыёбачнасці. Па каналах С.р. перадаюцца сігналы тэлефаніі, лічбавыя даныя, відэасігналы, тэлетэкст і інш. з частотным, часавым ці кодавым раздзяленнем сігналаў. С.р. забяспечвае глабальны доступ да баз даных, сеткі Інтэрнет, тэле- і радыёпраграм і інш. мультымедыйнай інфармацыі. Дазваляе ўстанавіць кантроль за месцазнаходжаннем і станам рухомых аб'ектаў, а таксама забяспечыць персанальную сувязь з абанентамі з месцаў, недаступных для наземных сродкаў сувязі, у т.л. ў цяжкадаступных, аддаленых і маланаселеных раёнах. Для арганізацыі С.р. выкарыстоўваюць розныя тыпы наземных радыёстанцый (стацыянарныя, рухомыя, персанальныя і інш.) і розныя тыпы ШСЗ (шматфункцыянальныя, спецыялізаваныя і інш.). Рэтрансляцыя ажыццяўляецца ў рэальным маштабе часу (найб. пашырана), у некаторых выпадках — з часавай затрымкай (у нізкаарбітальных сістэмах С.р.). Выкарыстоўваецца для арганізацыі міжнар., нац., а таксама асобных (карпаратыўных, ведамасных, банкаўскіх структур і інш.) сетак сувязі незалежна ад месцазнаходжання карыстальнікаў.

Э.Б.Ліпковіч.

СПАДАРО́ЖНІКІ ПЛАНЕ́Т, целы *Сонечнай сістэмы*, якія абарачаюцца вакол вял. планет пад дзеяннем іх прыцягнення. Першыя адкрыцці С.п. (акрамя *Месяца*) адносяцца да пач. 17 ст. (4 спадарожнікі Юпітэра; 1610, Г.Галілей). У тым жа стагоддзі выяўлены 5 спадарожнікаў Сатурна, у 18 ст. — па 2 спадарожнікі Урана і Сатурна, у 19 ст. — па 1 у Нептуна і Юпітэра, па 2 у Марса, Сатурна і Урана. У 1-й пал. 20 ст. адкрыты 6 спадарожнікаў Юпітэра, па 1 — Урана і Нептуна. Да 1979 былі вядомы 34 С.п. Спрыяльныя ўмовы для назірання Сатурна з Зямлі, а таксама палёты касм. апаратаў «*Піянер*» і «*Вояджэр*» прывялі да адкрыцця новых С.п. Усяго вядомы 91 С.п. (2001); 66 маюць уласныя назвы, астатнія — часовыя абазначэнні.

У Меркурыя і Венеры (бліжэйшыя да Сонца планеты) няма прыродных спадарожнікаў; у Зямлі 1 — Месяц; у Марса 2 — *Фобас* і *Дэймас*. У Юпітэра 28 спадарожнікаў (16 з уласнымі назвамі, 12 з часовымі абазначэннямі). Спадарожнікі з уласнымі назвамі падзяляюцца на 4 групы: Галілеевы спадарожнікі, — *Іо, Еўропа, Ганімед, Каліста* і 3 групы малых — 4 унутр. спадарожнікі (Адрастэя, *Амальтэя*, Метыда, Тэба) знаходзяцца бліжэй да планеты, чым Іо, і ўтвараюць кальцавую сістэму Юпітэра; 4 знешнія (*Гімалія, Леда*, Лісітэя, Элара) — з прамым рухам (напрамак супадае з напрамкам руху планеты) на адлегласці каля 11 млн. км; 4 знешнія (*Ананке, Карме, Пасіфе, Сінопе*) — з адваротным напрамкам руху на адлегласці каля 22 млн. км. Галілеевы і ўнутраныя спадарожнікі рухаюцца ў плоскасці экватара Юпітэра па амаль кругавых арбітах (рэгулярныя С.п.), астатнія — па эксцэнтрычных вельмі нахіленых арбітах (нерэгулярныя С.п.). У Сатурна 30 спадарожнікаў (18 з уласнымі назвамі, 12 з часовымі абазначэннямі): *Тытан* (самы вялікі), Атлас, *Гіперыён, Дыёна*, Елена, Каліпса, *Мімас*, Пан, Пандора, Праметэй, *Рэя*, Тэлеста, *Тэфія, Феба, Энцэлад, Эпіметэй, Янус, Япет*. Уран мае 21 спадарожнік: 15 рэгулярных (*Аберон, Арыэль, Міранда, Тытанія, Умбрыэль* і інш.), 5 нерэгулярных, 1 адкрыты ў 1999 (арбіта не вызначана). У Нептуна 8 спадарожнікаў, 2 з якіх (*Нерэіда* і *Трытон*) адкрыты наземнымі метадамі, 6 — пры пралёце «Вояджэра» паблізу планеты. Плутон мае 1 спадарожнік — *Харон*.

Літ.: Гл. да арт. *Сонечная сістэма.*

А.А.Шымбалёў.

СПАДУМЕ́Н (ад грэч. spodumenos спапялёны), т р ы ф а н , пародаўтваральны мінерал падкласа ланцужковых сілікатаў, LiAl [Si_2O_6]. Крышталізуецца ў манаклінній сінганіі. Утварае сплошчаныя, моцна выцягнутыя прызматычныя крышталі, зярністыя агрэгаты. Колер белы, шараваты, жаўтаваты, зеленаватажоўты. Ювелірныя каштоўныя разнавіднасці (гідэніт — блакітна-зялёны і кунцыт — ружова-бэзавы) празрыстыя. Моцны дыхраізм. Цв. 6,5 — 7. Шчыльн. 3,1 — 3,2 г/см^3. Утвараецца ў гранітных натралітыевых пегматытах. Гал. руда літыю (гл. *Літыевыя руды*). Радовішчы ў ЗША, Аўстраліі, Расіі, Афганістане і інш.

СПА́ДЧЫНА ў п р а в е , маёмасць, якая пераходзіць ад памерлага да спадчыннікаў. Паводле *спадчыннага права* Рэспублікі Беларусь у С. пераходзяць усе правы і абавязкі, што належалі спадчынадаўцу на момант адкрыцця С. і існаванне якіх не спыняецца з яго смерцю. У С. не ўваходзяць правы і абавязкі, непарыўна звязаныя з асобай спадчынадаўцы: правы членства (удзелу) у камерцыйных і інш. арг-цыях, што з'яўляюцца юрыд. асобамі (калі іншае не ўстаноўлена законам або ўстаноўчымі дакументамі); права на кампенсацыю шкоды, нанесенай яго жыццю або здароўю; правы і абавязкі па аліментных абавязацельствах; права на пенсіі, дапамогі і інш. выплаты на падставе заканадаўства аб працы і сац. за-

беспячэнні; асабістыя немаёмасныя правы, не звязаныя з маёмаснымі. Асабістыя немаёмасныя правы і інш. нематэрыяльныя даброты, што належалі спадчынадаўцу, могуць ажыццяўляцца і абараняцца спадчыннікамі, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўствам.

Г.А.Маслыка.

«СПА́ДЧЫНА», ілюстраваны культурна-гістарычны часопіс. Выдаецца з 1970 у Мінску на бел. мове. Да 1989 выходзіў штоквартальна пад назвай *«Помнікі гісторыі і культуры Беларусі»*, з 1991 выходзіць раз у 2 месяцы. Асвятляе пытанні аховы, вывучэння, прапаганды помнікаў гісторыі і культуры, праблемы бел. гіст. і культ. спадчыны ў еўрап. кантэксце. Публікуе артыкулы і архіўныя матэрыялы па гісторыі Беларусі, філас. думцы, гісторыі мастацтва і рэлігіі, культ. спадчыне нац. меншасцей Беларусі, гісторыі замежных краін, аб жыцці і дзейнасці бел. дыяспары, меркаванні пра шляхі развіцця нац. культуры, захавання гіст. памяці. Змяшчае пераклады і перадрукоўкі айч. і замежнай гістарыяграфічнай і літ. спадчыны.



«СПА́ДЧЫНА», культурна-асветны клуб. Створаны ў сак. 1984 у Мінску з мэтай прапаганды і папулярызацыі бел. культуры і гісторыі. Кіраўніцтва ажыццяўляе рада. На пасяджэнні запрашаюцца вучоныя, пісьменнікі, грамадскія дзеячы, абмяркоўваюцца іх навук. паведамленні і рэфераты. Члены клуба адзначаюць выдатныя падзеі ў грамадскім і культ. жыцці краіны, арганізоўваюць і праводзяць выстаўкі, удзельнічаюць у выданні альманахаў, плакатаў-календароў на гіст. тэмы. На дабрачынныя сродкі і ахвяраванні клубам зроблены і пастаўлены помнікі М.Багдановічу (1994, Ярослаўль), Ф.Скарыне, М.Гусоўскаму (абодва 1998, Мінск), Ефрасінні Полацкай (1999, Мінск; 2000, Полацк), бюст А.Багдановічу (1998, г.п. Халопенічы), шыльда на будынку, дзе ў 1915—18 дзейнічаў у эвакуацыі Мінскі настаўніцкі ін-т (1995, Ярослаўль) і інш.

Пры клубе створаны фалькл. гурт, які праводзіць фалькл. святы (гуканне вясны, Купалле, Каляды). *А.Я.Белы.*

СПА́ДЧЫННАЕ ПРА́ВА, сукупнасць прававых норм, якія ўстанаўліваюць парадак пераходу правоў і абавязкаў памерлай асобы па праве атрымання *спадчыны*; частка *цывільнага права*. Вызначае падставы атрымання ў спадчыну (паводле закону і завяшчання): час і месца адкрыцця спадчыны; што пераходзіць па спадчыне; хто можа быць спадчыннікам; пераход права на прынятае спадчыны і адмовы ад яе; прад'яўленне прэтэнзій крэдытораў спадчынадаўцы; ахова і раздзел спадчыннай маёмасці; парадак прыняцця спадчыны; выдача пасведчання аб праве на спадчыну і інш. С.п. забяспечвае бесперашкодны пераход права ўласнасці і інш. маёмасных правоў памерлага да яго спадчыннікаў. Нормы С.п. Рэспублікі Беларусь змешчаны ў цывільным кодэксе.

Г.А.Маслыка.

СПА́ДЧЫННАСЦЬ, уласцівасць арганізмаў забяспечваць матэрыяльную і функцыян. пераемнасць пакаленняў; адзін з гал. фактараў *эвалюцыі*. Праяўляецца ў бесперапыннасці жывой матэрыі пры змене пакаленняў. Фактары С. лакалізаваны ў *храмасомах* і *цытаплазме* (*спадчыннасць цытаплазматычная*). Генет. інфармацыя захоўваецца, узнаўляецца і перадаецца пры размнажэнні арганізмаў у выглядзе малекул нуклеінавых к-т (ДНК, РНК), якія з'яўляюцца матэрыяльнымі носьбітамі ўсіх відаў С. Асобная роля ў С. належыць дакладнасці ўзнаўлення малекул нуклеінавых к-т у працэсах *рэплікацыі* і *транскрыпцыі*, а таксама высокай ступені дакладнасці сінтэзу бялкоў у працэсе *трансляцыі*. Рэалізацыя С. залежыць ад асаблівасцей *генатыпу*, знешніх умоў і адбываецца ў розных варыянтах. Напр., асобіны з розным генатыпам маюць аднолькавы *фенатып* (гл. *Дамінантнасць*), арганізмы з аднолькавым генатыпам — розны фенатып (гл. *Мадыфікацыі*). Функцыян. пераемнасць пакаленняў забяспечваецца таксама перадачай інфармацыі ад аднаго пакалення да другога ў ходзе навучання, т.зв. сігнальная С. Аснова гэтага працэсу — умоўнарэфлекторная дзейнасць вышэйшых арганізмаў (асабліва ў чалавека). У ходзе ўзнікнення і развіцця жыцця на Зямлі С. адыгрывала вырашальную ролю шляхам спалучэння кансерватыўнасці са *зменлівасцю* ў замацаванні дасягнутых эвалюцыйных пераўтварэнняў. Вывучэнне заканамернасцей С. мае важнае значэнне для медыцыны, сельскай гаспадаркі і інш. Гл. таксама *Дарвінізм*, *Мендэля законы*.

Р.Г.Заяц.

СПА́ДЧЫННАСЦЬ ЦЫТАПЛАЗМАТЫ́ЧНАЯ, узнаўленне ў шэрагу пакаленняў адзнак, што кантралююцца нуклеінавымі к-тамі клетачных арганоідаў — мітахондрый, хларапластаў і, магчыма, інш. пазахрамасомнымі элементамі. Крытэрыі С.ц.: наследаванне па мацярынскай лініі, адсутнасць колькаснага мендэлеўскага расшчаплення ў патомстве, немагчымасць выяўлення счаплення генаў, розныя вынікі *рэцыпрокнага скрыжавання*. У вышэйшых эўкарыётаў С.ц. характарызуецца «мацярынскім эфектам» — праз цытаплазму перадаюцца толькі адзнакі маці. Некат. віды С.ц. выкарыстоўваюцца ў сельскай гаспадарцы, напр., цытаплазматычная мужчынская стэрыльнасць у кукурузы дазваляе ствараць высокапрадукцыйныя міжлінейныя гібрыды. *Р.Г.Заяц.*

СПА́ДЧЫННЫХ І ПРЫРО́ДЖАНЫХ ЗАХВО́РВАННЯЎ НДІ Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь. Засн. ў 1988 у Мінску на базе філіяла Ін-та мед. генетыкі Акадэміі мед. навук СССР (у 1967 у Мінскім мед. ін-це створана лабараторыя тэраталогіі і мед. генетыкі, якая ў 1981 пераўтворана ў філіял Ін-та мед. генетыкі АМН СССР).

Асн. кірункі навук. дзейнасці: прафілактыка спадчынных і прыроджаных захворванняў, вывучэнне генетычных наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС у насельніцтва, распрацоўка метадаў прэнатальнай і перадімплантацыйнай дыягностыкі. У ін-це працуе чл.-кар. Нац. АН Беларусі *Г.І.Лазюк* (дырэктар з 1988).

СПА́ДЧЫННЫЯ ХВАРО́БЫ, хваробы чалавека, абумоўленыя *мутацыямі*. Падзяляюцца на *храмасомныя хваробы*, генныя і мультыфактарыяльныя. Храмасомныя хваробы (храмасомныя сіндромы) характарызуюцца мутацыямі храмасом, генныя (манагенныя) — генаў. Найб. пашыраны мультыфактарыяльныя (мутацыі аднаго або некалькіх генаў, якія ствараюць павышаную адчувальнасць да ўздзеяння на арганізм шкодных фактараў). Вядомы таксама генет. хваробы, звязаныя са зменамі генных структур саматычных клетак (праяўляюцца некат. злаякаснымі пухлінамі, радзей — прыроджанымі *заганамі развіцця*).

Для большасці С.х. (практычна ўсе храмасомныя хваробы і да $^1/_3$ манагенных) характэрна ранняе праяўленне — унутрыутробна або ў дзіцячым узросце. Часта яны працякаюць хранічна з рэцыдывамі (біяхім. і *малекулярныя хваробы*), адначасова пашкоджваюцца многія органы (храмасомныя і манагенныя сіндромы), цяжка паддаюцца лячэнню. Для дыягностыкі С.х. прымяняюць біяхім. і малекулярныя метады, праводзяць цытагенет. і малекулярна-цытагенет. даследаванні. Важнае значэнне ў прафілактыцы С.х., іх ранняй дыягностыцы, своечасовым лячэнні мае *медыка-генетычнае кансультаванне*. Лячэнне сімптаматычнае, патагенетычнае, накіраванае на карэкцыю абмену рэчываў (дыетхарчаванне, харч. дабаўкі, увядзенне ферменту, якога не

хапае). На Беларусі пытаннямі С.х. займаецца НДІ спадчынных і прыроджаных захворванняў. *Г.І.Лазюк.*

СПАЖЫВА́ННЕ, выкарыстанне грамадскага прадукту для задавальнення вытворчых і асабістых патрэб людзей; заключная стадыя ўзнаўленчага цыкла. Адрозніваюць С. вытворчае і невытворчае. Вытворчае — выкарыстанне сродкаў вытворчасці (машыны, інструменты, паліва, сыравіна і г.д.) і рабочай сілы чалавека ў працэсе вырабу прадукцыі; невытворчае — выкарыстанне прадметаў ужытку. Апошняе падзяляецца на асабістае і грамадскае. Асабістае — выкарыстанне чалавекам харч. прадуктаў, адзення, абутку, тавараў культ.-быт. ўжытку, паліва, жылля і г.д., а таксама задавальненне яго патрэб у адукацыі, адпачынку, ахове здароўя і інш. Канчатковым вынікам размеркавання фонду асабістага С. з'яўляецца фарміраванне сямейных бюджэтаў (гл. *Бюджэт спажывецкі*), сукупных даходаў працуючых і непрацуючых чл. сям'і. Грамадскае С. ўключае спажываныя матэрыяльныя каштоўнасці і паслугі арг-цыямі і ўстановамі невытворчай сферы (адукацыя, ахова здароўя, навука, абарона, кіраванне і інш.).

СПАЖЫВЕ́ЦКАЙ КААПЕРА́ЦЫІ НДІ. Засн. ў 1971 у Мінску як Бел. філіял Цэнтр. н.-д. лабараторыі Цэнтрасаюза па вывучэнні попыту. З 1979 Бел. філіял Усесаюзнага НДІ эканомікі каап. гандлю Цэнтрасаюза, з 1987 Бел. філіял Усесаюзнага НДІ спажывецкай кааперацыі Цэнтрасаюза. З 1992 НДІ спажывецкай кааперацыі Рэспублікі Беларусь, з 1997 НДІ Белкаапсаюза. Асн. кірункі дзейнасці: маніторынг і даследаванне эканам. праблем развіцця і павышэння эфектыўнасці галін спажывецкай кааперацыі; даследаванне фін.-крэдытнай і падатковай палітыкі, цэнаўтварэння і бухгалтарскага ўліку, укаранення рынкавых форм і метадаў у работу каап. арг-цый і прадпрыемстваў; вывучэнне праблем рацыянальнага выкарыстання прац. рэсурсаў, росту прадукцыйнасці працы, перспектыўных кірункаў знешнеэканам. дзейнасці арг-цый і прадпрыемстваў спажывецкай кааперацыі Беларусі; даследаванне асобных тавараных рынкаў і ацэнка перспектыў іх развіцця, праблем удасканальвання арганізацыі гасп. сувязей з пастаўшчыкамі і пакупнікамі, пытанняў развіцця каап. руху, вывучэнне кан'юнктуры гандлю; навукова-метадычнае забеспячэнне каледжаў Белкаапсаюза і сістэмы бесперапыннай прафес. адукацыі і інш.

СПАЖЫВЕ́ЦКАЯ ВА́РТАСЦЬ, карыснасць рэчы (тавару, прадукцыі і інш.), якая вызначаецца сукупнасцю спажывецкіх якасцей і выяўляецца пры задавальненні патрэбнасці ў адпаведнасці з яе прызначэннем і ўстаноўленымі ўмовамі спажывання або эксплуатацыі. Гл. таксама *Вартасць*.

СПАЖЫВЕ́ЦКАЯ КААПЕРА́ЦЫЯ, від кааперацыі, якая ўяўляе сабой сістэму спажывецкіх таварыстваў, іх саюзаў і створаных імі унітарных прадпрыемстваў і ўстаноў з мэтай задавальнення патрэб членаў спажывецкіх т-ваў і насельніцтва шляхам арганізацыі гандлёвай, закупачнай, вытворчай і іншай дзейнасці. Узнікла ў Англіі ў 1844. З сярэдзіны 19 ст. кааператывы актыўна ствараліся ў Францыі, Італіі, Германіі, Скандынаўскіх краінах і інш. У Расіі першы рабочы кааператыў з'явіўся ў 1864. У 1895 створаны *Міжнародны кааператыўны альянс*, які аб'ядноўвае нац. і рэгіянальныя саюзы кааператываў.

Першы спажывецкі кааператыў на Беларусі зарэгістраваны ў 1892, да 1917 дзейнічала 359 спажывецкіх т-ваў. У чэрв. 1917 у Мінску арганізаваны саюз спажывецкіх т-ваў Мінскага р-на, які пазней пераўтвораны ў Цэнтральны саюз спажывецкіх т-ваў Беларускага краю, а потым — у Беларускі рэсп. саюз спажывецкіх т-ваў (Белкаапсаюз). Да сярэдзіны 1930 спажывецкія т-вы функцыянавалі ў гарадах і ў вёсках, з 1935 С.к. абслугоўвае ў асноўным вясковае насельніцтва. У 2001 у Белкаапсаюзе 1,4 млн. пайшчыкаў, аб'яднаных у 118 раённых і 2 рэгіянальныя спажывецкія т-вы. Больш як 136 тыс. працаўнікоў С.к. абслугоўвалі 3,5 млн. чал. (85% з іх былі вяскоўцы). Тавараабарот склаў 993,3 млрд. руб., ці 18,6% рознічнага тавараабароту краіны. На яго долю прыпадае 3,2% унутр. валавога прадукту рэспублікі, 4,5% працоўных рэсурсаў, 51% аб'ектаў гандлю, 42% прадпрыемстваў гармадскага харчавання. Вырабляе 24% хлебабулачных, 26% макаронных, 14% каўбасных, рыбных вырабаў, 12% кансерваў, 7% мінеральнай вады. С.к. мае 105 хлебазаводаў і пякарань, 122 каўбасныя, 124 кандытарскія і 68 рыбаперапрацоўчых цэхаў, 25 кансервавых прадпрыемстваў, 5 камбінатаў і 175 цэхаў па вырабе непрадуктовых тавараў, 7 зверагаспадарак па гадаванні ліса, норкі, пясца. На канец 2001 у сістэме Белкаапсаюза 3,6 тыс. прадпрыемстваў грамадскага харчавання, у т.л. 513 у калгасах і саўгасах, 1850 у навуч. установах, 12,5 тыс. магазінаў, 719 ларкоў, палатак, кіёскаў. 418 аўтамагазінаў і 433 хатнія крамы абслугоўвалі больш як 6 тыс. вёсак, у якіх менш за 25 жыхароў. С.к. закупляе і перапрацоўвае больш за 30 відаў с.-г. прадукцыі і сыравіны на 95,8 млрд. руб. (2001).

З 1992 Белкаапсаюз — чл. Міжнар. каап. альянсу, падтрымлівае кантакты з кааператарамі і фірмамі больш як 30 краін. Знешнегандлёвы абарот у 2001 склаў 34,6 млн. дол. ЗША. Мае ўласныя навуч. ўстановы: Бел. гандлёва-эканам. ун-т спажывецкай кааперацыі, Рэсп. ін-т павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў Белкаапсаюза, 6 каледжаў, 2 прафтэхвучылішчы.

Узаемадзеянне спажывецкай кааперацыі з дзяржавай рэгулюецца Законам «Аб спажывецкай кааперацыі (спажывецкіх таварыствах, іх саюзах) у Рэспубліцы Беларусь» (2002). *С.Я.Пушкіна.*

СПАЖЫВЕ́ЦКІ КО́ШЫК, навукова абгрунтаваны, збалансаваны набор тавараў і паслуг, якія забяспечваюць функцыян. патрэбы чалавека ў пэўныя адрэзкі часу, выходзячы з канкрэтных умоў і асаблівасцей, якія ўсталяваліся ў краіне. З'яўляецца таксама асновай пры параўнанні разліковых і рэальных узроўняў спажывання. Фарміруецца па артыкулах расходаў чалавека або сям'і на: харчаванне (хлеб і хлебабулачныя вырабы, мясныя і малочныя прадукты, яйкі, рыба і рыбапрадукты, бульба, агародніна, садавіна і ягады, алей, цукар і інш.); адзенне, бялізна, абутак; тавары працяглага карыстання; расходы на сац.-культ. патрэбы і г.д. Структура і склад С.к. пераглядаюцца з улікам сац.-эканам. развіцця краіны і змен у нормах спажывання грамадзян.

СПАЖЫВЕ́ЦКІ КРЭДЫ́Т, крэдыт, які выдаецца насельніцтву на задавальненне бягучых патрэб і на развіццё вытв-сці ў асабістай гаспадарцы, набыццё, буд-ва ці рамонт жылля, аплату паслуг, пазыкі, якія маюць сац. характар (маладым сем'ям, студэнтам) і г.д. С.к. могуць быць грашовыя і тавараныя. У ролі *крэдыторaў* выступаюць банкі, крэдытныя кааператывы, ламбарды, касы ўзаемадапамогі, прадпрыемствы і арг-цыі. Тэрміны крэдытавання, памеры крэдытаванні, платы за карыстанне імі рэгламентуюцца заканадаўствам, статутамі арг-цый-крэдыторaў. Гл. таксама *Крэдыт*.

СПАЖЫВЕ́ЦКІЯ ТАВА́РЫ, гл. *Тавары народнага спажывання*.

СПАЖЫЎНАЯ КУХО́ННАЯ СОЛЬ, кухонная соль, тое, што натрыю хларыд. Гл. ў арт. *Натрыю злучэнні*.

СПА́ЗМА (ад грэч. spasmos або spasma сутарга), міжвольнае скарачэнне папярочна-паласатых або гладкіх мышцаў, якое не суправаджаецца неадкладным расслабленнем. Напр., пры парушэннях вегетатыўнай інервацыі бывае С. гладкай мускулатуры сасудаў — *ангіяспазма*, гартані — *ларынгаспазма*, С. мускулатуры прываротніка страўніка — *піларaспазма* і інш.

СПАЗМАЛІТЫ́ЧНЫЯ СРО́ДКІ (ад *спазма* + грэч. lysis аслабленне), лекавыя сродкі, якія прадухіляюць спазмы гладкай мускулатуры і сасудаў. Падзяляюцца на міятропныя (непасрэднае расслабленне гладкіх мышцаў) — но-шпа, папаверын, дыбазол, эўфілін і інш. і нейратропныя (уздзеянне на розныя аддзелы нерв. сістэмы) — атрапін, скапаламін, спазмаліцін, бензагексоній, салбутамол. С.с. знімаюць болі, звязаныя са спазмамі гладкамышачных органаў брушной поласці (страўнік, кішэчнік, жоўце- і мочавывадныя шляхі, матка), паляпшаюць вентыляцыю лёгкіх пры спазме бронхаў, зніжаюць артэрыяльны ціск і паляпшаюць мясц. крыва-

цёк (у мозгу, сэрцы, канечнасцях) у выніку расшырэння сасудаў. *І.М.Семяненя.*

СПАЗМАФІЛІ́Я (ад *спазма* + *...філія*), тэтанія, узнікненне сутаргаў у дзяцей ад 6 мес да 2 гадоў. Адбываецца ў выніку зніжэння іанізавальнага кальцыю ў крыві і павышэння нервова-мышачнай узбуджальнасці. Бывае наяўная (*ларынгаспазма*, сутаргі) і скрытая (пасля ўдару або сціскання мышцаў, кароткачасовае спыненне дыхання пры ўколе). Лячэнне тэрапеўтычнае. *І.М.Семяненя.*

СПА́ЙНАСЦЬ, уласцівасць крышталёў расколвацца ці расшчапляцца па пэўных крышталеграфічных напрамках, што абумоўлена будовай іх *крышталічных рашотак*; дыягнастычная прыкмета мінералаў. Плоскасці С. і плоскасці ў крышталеграфічнай рашотцы мінералаў з найб. рэтыкулярнай шчыльнасцю атамаў звычайна супадаюць; залежаць таксама ад тыпу хім. сувязей у мінерале.

Адрозніваюць С. вельмі дасканалую (напр., слюды), дасканалую (напр., кальцый), сярэднюю (напр., піраксены) і недасканалую (напр., кварц, пірыт). У адным крышталі ў адпаведнасці з яго сіметрыяй і тыпам структуры могуць праявіцца некалькі (да 6 у сфалерыце) па-рознаму арыентаваных плоскасцей С., якія адрозніваюцца паводле ступені дасканаласці.

СПАКА́Н, Спакен (Spokane), горад на ПнЗ ЗША, каля парогаў на р. Спакан (бас. р. Калумбія), у штаце Вашынгтон. Засн. ў 1881. 184,1 тыс. ж., з прыгарадамі больш за 350 тыс. ж. (1998). Вузел чыгунак і аўтадарог. Міжнар. аэрапорт. Прам-сць: каляровая металургія (выплаўка і пракат алюмінію), радыёэлектронная, у т.л. вытв-сць ЭВМ; прыладабуд., харч., паліграф., хім., дрэваапр.; вытв-сць прамысл. абсталявання. ГЭС. Ун-т. Турызм. У 1974 у С. адбылася Сусв. выстаўка па праблеме аховы прыроднага асяроддзя «Экспа-74».

СПАКО́Й у раслін, фізіялагічны стан, пры якім зніжаецца ці спыняецца рост і інтэнсіўнасць абмену рэчываў. Праяўляецца ў затрымцы прарастання насення, клубняў, цыбулін і распускання пупышак як прыстасаванне да неспрыяльных знешніх умоў у пэўныя перыяды жыццёвага цыкла або сезона года. У перыяд спакою павышаецца здольнасць расліны пераносіць без пашкоджання засуху, высокія ці нізкія т-ры і інш. Адрозніваюць глыбокі спакой, пры якім рост не аднаўляецца нават пры аптымальных знешніх умовах (выклікаецца ўнутр. фактарамі — інгібітарамі росту), і вымушаны (выклікаецца знешнімі фактарамі), спыняецца з надыходам спрыяльных умоў. Дрэвавыя расліны восенню пераходзяць у глыбокі спакой, які пад канец зімы змяняецца вымушаным задоўга да распускання пупышак. У трапічных і субтрапічных паясах з засушлівым перыядам вегетацыя раслін перарываецца летнім спакоем.

СПАЛУЧА́ЛЬНЫ ЗАКО́Н, асацыятыўны закон, гл. ў арт. *Асацыятыўнасць.*

СПАЛУ́ЧАНЫЯ ГІПЕ́РБАЛЫ, дзве *гіпербалы*, ураўненні якіх у адной і той жа сістэме каардынат адрозніваюцца знакам свабоднага члена: $x^2/a^2-y^2/b^2 = 1$ і $x^2/a^2 - y^2/b^2 = -1$. Маюць агульныя асімптоты; сапраўдная вось адной з іх з'яўляецца ўяўнай воссю другой і наадварот.



Спалучаныя гіпербалы: *а*, *в* — паўвосі гіпербал.

СПАЛУ́ЧАНЫЯ ЛІ́КІ, камплексна спалучаныя лікі, два *камплексныя лікі*, якія адрозніваюцца адзін ад аднаго толькі знакам уяўнай часткі: $z = a + ib$ і $\bar{z} = a - ib$. Сума і здабытак С.л. — сапраўдныя лікі. Калі z з'яўляецца *коранем* многасклада з сапраўднымі каэфіцыентамі, то $\bar{z}$ таксама з'яўляецца коранем таго ж многасклада і мае такую ж кратнасць, што і z.

СПАЛУ́ЧАНЫЯ РЭА́КЦЫІ, дзве *складаныя рэакцыі*, якія адбываюцца пры наяўнасці прынамсі аднаго агульнага рэагенту, прычым адна з рэакцый выклікае ці паскарае другую.

Прыклад С.р. — акісленне сульфату жалеза(II) $FeSO_4$ і ёдзістага вадароду HI пераксідам вадароду H_2O_2; $FeSO_4$ акісляецца незалежна ад прысутнасці HI, а акісленне HI ідзе толькі ў прысутнасці $FeSO_4$. Такая перадача рэакцыйнай здольнасці ад адной рэакцыі да другой наз. хімічнай індукцыяй. Яе механізм абумоўлены ўдзелам аднолькавых прамежкавых актыўных часціц у кожнай са С.р., напр., рэакцыі акіслення $FeSO_4$ і HI адбываюцца з удзелам радыкалаў OH, якія ўтвараюцца пры ўзаемадзеянні $FeSO_4$ і H_2O_2. Адыгрываюць важную ролю ў біяхіміі: біясінтэз бялкоў і нуклеінавых кіслот у клетцы — рэакцыі, спалучаныя з гідролізам пірафасфатнай сувязі ў адэназінтрыфосфарнай кіслаце (АТФ).

СПАЛУ́ЧАНЫЯ ФУ́НКЦЫІ, функцыі $u(x, y)$ і $v(x, y)$ сапраўдных пераменных x і y, звязаныя паміж сабой *Кашы—Рымана ўраўненнямі*: $du/dx = dv/dy$, $du/dy = -dv/dx$. Калі вытворныя С.ф. неперарыўныя, то $u(x, y)$ і $v(x, y)$ з'яўляюцца адпаведна сапраўднай і ўяўнай часткамі *аналітычнай функцыі* $f(z) = u + iv$. Калі вядома адна з С.ф., то другая, а таксама $f(z)$, вызначаецца з дакладнасцю да адвольнай пастаяннай.

СПАЛУЧЭ́ННЕ ў камбінаторыцы, сукупнасць n элементаў, якія выбраны з m дадзеных элементаў і адрозніваюцца адна ад адной хаця б адным элементам; падмноства магутнасці n некатарага зыходнага канечнага мноства магутнасці m. Лік С. з m элементаў па n абазначаецца C_m^n ці $\binom{n}{m}$, $C_m^n = \frac{A_m^n}{P_n} = \frac{m!}{n!\,(m-n)!}$, дзе A_m^n — лік *размяшчэнняў* з m элементаў па n, P_n — лік *перастановак* з n элементаў. С. можна разглядаць таксама як неўпарадкаваную выбарку аб'ёму n з генеральнай сукупнасці з m элементаў.

СПАМПА́НІ (Spampani) Карла (1750, Рым? — 2.5.1783), архітэктар; прадстаўнік паладыянскай школы (гл. *Паладыянства*). На Беларусі ўдзельнічаў у стварэнні *Шчорсаўскага палацава-паркавага комплексу* (1770—76) і *Нясвіжскага палацава-паркавага комплексу* (1778—79). Паводле яго праектаў пабудаваны *Радзівілімонтаўскі палацава-паркавы комплекс*, палац у г. Заслаўе Мінскай вобл. (1778—82), сядзібны дом і лямус у в. Беніца Маладзечанскага р-на Мінскай вобл., мост і капліца ў в. Кухцічы (цяпер пас. Першамайскі Уздзенскага р-на Мінскай вобл.). У 1773 у Вільні кіраваў буд-вам асобных карпусоў езуіцкага калегіума і прыбудовай да абсерваторыі ун-та, у 1775 стварыў праект палаца ў Паўлаве (каля Вільні), у 1782 абнаўляў капліцу св. Казіміра ў кафедральным саборы. *Гл.Барышаў, В.Ф.Марозаў.*



К.**Спампані**. Сядзіба ў вёсцы Беніца Маладзечанскага раёна. З малюнка Н.Орды 19 ст.

СПА́НАЎКА, Шпанаўка, рака ў Брэсцкім р-не, правы прыток р. Зах. Буг. У верхнім цячэнні наз. Прырва. Даўж. 25 км. Пл. вадазбору 200 км². Пачынаецца са старога прыроднага рэчышча каля левага берага канала Прырва за 200 м ад моста на аўтадарозе Рагозна—Брадзяцін, за 3 км на У ад в. Рагозна. Цячэ па паўд.-зах. ч. Брэсцкага Палесся. Вусце за 2 км на Пн ад в. Страдзеч. Рэчышча амаль на ўсім працягу каналізаванае.

СПАНДЫЛААРТРЫ́Т (ад грэч. spondylos пазванок + *артрыт*), запаленне міжпазванковых суставаў. Звычайна С. — праява сістэмных захворванняў апорна-рухальнага апарату (хвароба Бехцерава), інфекцыйны. Праявы: боль у вобласці пазваночніка, крыжа-падуздышных суставаў, скаванасць (асабліва ўранку) і напружанне мышц спіны, дэфармацыя пазваночніка і абмежаванне яго рухомасці. Пры пашкоджанні рэберна-пазваночных суставаў абмяжоўваюцца дыхальныя рухі грудной клеткі. Зрэдку пашкоджваюцца перыферычныя суставы і розныя органы (вочы, ныркі, прастата і інш.). Лячэнне медыкаментознае, фізіятэрапеўтычнае. *І.М.Семяненя.*

СПАНДЫЛІ́Т (ад грэч. spondylos пазванок), запаленне структурных элементаў *пазваночніка*, пераважна інфекц. характару. Бывае спецыфічны (туберкулёзны — найб. часты, грыбковы, сіфілітычны, ганарэйны, тыфозны і інш.) і неспецыфічны (гнойны, рэўматоідны і інш.). Праяўляецца лакальным болем, павышэннем т-ры цела, слабасцю, павышанай стамляльнасцю і інш. Пры гнойным С. целы пазванкоў паступова разбураюцца, пазваночнік дэфармуецца. Пры працяглым цячэнні туберкулёзнага С. развіваецца горб. Скрыўленне пазваночніка парушае функцыі органаў грудной поласці. Ускладненні: абсцэсы, свішчы і інш. Лячэнне тэрапеўт., хірургічнае. *І.М.Семяненя.*

СПАНДЭ́Й (ад грэч. spondeios), стапа з 2 доўгіх складоў у антычным вершаскладанні. У сілабатоніцы С. называюць стапу *ямба* ці *харэя* са звышсхемным націскам:

> **Сне́г — трэ́ці** дзень.
> Слядоў няма,
> На двор і ў сад задзьмуты дзверцы.
> (М.Лужанін. «...Снег — трэці дзень»)

Дзякуючы С. аўтар можа вылучыць пэўнае слова ў вершаваным радку, звярнуць на яго ўвагу. Арыгінальнае выкарыстанне спандэізаваных харэяў у вершы М.Танка «На камарыным вяселлі»:

> На змярканні — **шу́м, га́м**, звон.
> Гэта звоняць **ду́б, гра́б**, клён.
> Кветак весніх — **жа́р, бе́ль**, сінь,
> Россып буйнае расы.
> *В.П.Рагойша.*

СПАНДЭ́КС, тое, што *поліурэтанавыя валокны*.

СПАНІЭ́ЛІ (англ. spaniel ад ісп. español іспанскі), група парод (больш за 20) *паляўнічых сабак* для палявання на вадаплаўную, балотную і баравую дзічыну. Знаходзяць дзічыну, выганяюць яе пад выстрал паляўнічага, адшукваюць застрэленых птушак. Выведзены ў 15—16 ст. у Іспаніі. Сучасныя пароды (кокер-С., спрынгер-С., фільд-С., нарфольд-С.) сфарміраваліся ў 18—19 ст. у Вялікабрытаніі. Выведзены дэкар. пароды С. (кінг-чарльз-С., той-С. і інш.).

Канстытуцыя моцная, сухая. Выш. ў карку 36—44 см. Масць чорная, карычневая (з падпалінамі), рыжая, белая або шэрая з плямамі і крапам. Поўсць доўгая, прамая або злёгку хвалістая, на вушах і лапах пачасе. Галава доўгая з выпуклым лбом і звіслымі вушамі. Хвост купіруюць. Тып паводзін ураўнаважаны-рухавы. Тыповы алюр на пошуку — лёгкі галоп.

СПАНТА́ННАЕ ВЫПРАМЯНЕ́ННЕ, вылучэнне эл.-магн. *выпрамянення* рэчывам ва ўзбуджаным стане, абумоўленае яго ўзаемадзеяннем з эл.-магн. *вакуумам*. Заканамернасці С.в. вызначаюцца ўласцівасцямі самой выпрамяняльнай сістэмы і не залежаць ад уздзеяння на яе знешняга эл.-магн. выпрамянення. С.в. вылучаецца крыніцамі аптычнага, рэнтгенаўскага і гама-выпрамянення (акрамя *лазераў*). Гл. таксама *Вымушанае выпрамяненне*.

СПАНТА́ННАСЦЬ (ад лац. spontaneus адвольны, добраахвотны), здольнасць дзейнічаць пад непасрэдным уплывам унутр. імпульсаў без умяшання звонку. У філасофіі даследуецца ў сувязі з *самаарганізацыяй, самарухам* прыроды (Б.Спіноза) і пазнання (Г.Лейбніц, Г.Гегель). У сацыялогіі разглядаецца як самаадвольныя, не інспіраваныя свядомасцю сац. з'явы (міграцыя насельніцтва, фарміраванне родаў, плямён, нацыі і інш.). Характэрна для ўсёй гісторыі чалавецтва, але ў працэсе сац. развіцця ў пэўнай ступені саступае месца свядомаму; часам адмоўна ўплывае на сац. развіццё, выклікаючы працэсы сац. дэзарганізацыі. Гл. таксама *Свядомасць і стыхійнасць*.

СПАРАВІКІ́ (Sporozoa), клас паразітычных прасцейшых. Каля 4 тыс. відаў. Пашыраны ўсюды. На Беларусі адзначаюцца *гемаспарыдыі*, ці кроваспаравікі, грэгарыны, какцыдыі, піраплазміды. Паразітуюць у клетках, тканках або поласцях жывёл і чалавека. Узбуджальнікі *какцыдыёзу, малярыі, піраплазмозаў* і інш.

Мікраскапічныя аднаклетачныя арганізмы. Жыццёвы цыкл характарызуецца чаргаваннем бясполага размнажэння (*шызаганія*), палавога працэсу (гаметаганія) і спараганіі (спарагенез) і зменай гаспадароў. Перадача паразітаў адбываецца аліментарным шляхам або пры кровасмактанні. Іл. гл. да арт. *Грэгарыны, Какцыдыі, Піраплазміды*.

СПАРА́ДЫ ПАЎДНЁВЫЯ, Дадэканес, група з 8 буйных і вял. колькасці дробных астравоў у Эгейскім м., каля паўд.-зах. ўзбярэжжа п-ва М. Азія, тэр. Грэцыі. Пл. 3,5 тыс. км². Асн. а-вы: Родас, Самас, Ікарыя, Кос, Карпатас. Пераважаюць узгоркі і нізкагор'і, выш. да 1434 м (г. Керкетэфс на в-ве Самас). Ксерафітныя хмызнякі, участкі лясоў з



Спаніэлі: 1 — кінг-чарльз-спаніэль; 2 — амерыканскі кокер-спаніэль; 3 — англійскі кокер-спаніэль; 4 — фільд-спаніэль; 5 — кламбер-спаніэль.

дубу, хвоі, кіпарысу. Вырошчванне збожжавых, вінаграду, цытрусавых, тытуню; аліўкавыя гаі. Рыбалоўства, здабыча губак. Буйн. гарады: Родас, Самас. Шматлікія помнікі стараж.-грэч. культуры.

СПАРА́ДЫ ПАЎНО́ЧНЫЯ, група з 77 астравоў і скал у Эгейскім м., тэр. Грэцыі. Пл. 540 км^2, найб. в-аў — Скірас (пл. 210 км^2, выш. да 793 м). Узгоркі і нізкагор'і. Складзены пераважна з вапнякоў, развіты карст. Ксерафітныя хмызнякі. Жывёлагадоўля. Вінаградарства. Рыбалоўства, здабыча губак.

СПАРА́ДЫ ЦЭНТРА́ЛЬНЫЯ ПАЛІНЕЗІ́ЙСКІЯ, група каралавых астравоў у Палінезіі; гл. *Лайн.*

СПАРА́НГІЙ (ад *споры* + грэч. angeion пасудзіна, умяшчальня), аднаклетачны (у грыбоў і многіх ніжэйшых раслін) ці мнагаклетачны (у вышэйшых) орган, у якім утвараюцца *споры*. У грыбоў і ніжэйшых раслін С. адрозніваюць па асаблівасцях структуры спор, што ў іх развіваюцца (зоаспарангій), колькасці спор (мона-, тэтраспарангій), знешнім выглядзе (цыстакарпій), спосабе ўтварэння спор (міта-, меяспарангій) і інш. Вышэйшыя расліны маюць толькі меяспарангіі, у мохападобных — каробачка спарагонія. У папараце- і дзеразападобных С. развіваюцца на *спарафілах* або ў іх пазухах і бываюць адзінкавыя ці групамі (*сорусы*). У раўнаспоравых папарацепадобных С. аднаго тыпу, і споры іх прарастаюць у двухполыя *зарасткі*. У разнаспоравых С. двух тыпаў (мікра- і мегаспарангій) прадуцыруюць *мікраспоры* і *мегаспоры*, з якіх развіваюцца мужчынскія і жан. зарасткі.

СПАРА́СІС КУЧАРА́ВЫ, грыб, тое, што *грыбная капуста.*

СПАРАФІ́Л (ад *споры* + грэч. phyllon ліст), відазменены лісцевы орган папараце-, дзеразападобнай ці насеннай расліны, на якім або ў пазусе якога развіваюцца спораўтваральныя органы (*спарангіі*). У некат. папарацей падобны на вегетатыўнае лісце ці адрозніваецца ад яго (напр., страусняк). Для дзераза-, хвошчападобных і голанасенных раслін характэрна ўтварэнне спец. спараносных парасткаў — *стробілаў* (каласкоў, шышак), якія маюць С., размешчаныя на восі.

СПАРАФІ́Т (ад *споры* + *...фіт*), бясполае пакаленне раслін, жыццёвы цыкл якіх мае чаргаванне палавога і бясполага пакаленняў; прадуцыруе споры. Утвараецца пасля апладнення — зліцця мужчынскай і жан. гаплоідных *гамет* у дыплоідную *зіготу*. З яе развіваецца мнагаклетачны зародак, што дае пачатак дарослай расліне. Кожная клетка С., як і зігота, мае звычайна падвоены набор храмасом. На С. фарміруюцца органы бясполага размнажэння — *спарангіі*, у якіх пасля рэдукцыйнага дзялення (меёзу) утвараюцца меяспоры з гаплоідным наборам храмасом. Яны даюць пачатак палавому пакаленню і *гаметафіту* з гаплоіднымі клеткамі. Выяўленасць С. ў розных груп раслін залежыць ад іх жыццёвага цыкла (напр., вышэйшыя зялёныя расліны, акрамя мохападобных, з'яўляюцца С., у мохападобных С. развіваецца на гаметафіце ў выглядзе органа (спарагонія) і не здольны існаваць аўтаномна).

СПА́РЖА, аспарагус (Asparagus), род кветкавых раслін сям. спаржавых. Каля 300 відаў. Пашыраны ва ўмераным і субтрапічным паясах Еўропы і Азіі. Як агародніннную расліну культывуюць С. лекавую (A. officinalis), вядомую ў стараж. Егіпце і Рыме. На Беларусі 1 дзікарослы від — С. лекавая, расце на берагавых схілах, узлесках, лугах, часам трапляюцца інш. здзічэлыя віды. У садах, аранжарэях і пакоях пад назвай «аспарагус» культывуюць С.: перыстую (A. plumosus), серпападобную (A. falcatus), Шпрэнгера (A. sprengeri) і інш.

Шматгадовыя моцна галінастыя травы, паўкусты і ліяны выш. 50—300 см. Відазмененыя парасткі (*кладодыі*) іголкападобныя або вузкалінейныя, у пучках ці адзіночныя. Лісце відазменена ў лускавінкі. Раздзельнаполыя кветкі дробныя, жаўтавата-зялёныя. Плод — шарападобная чырв. ягада. Маладыя сакаўныя парасткі, якія яшчэ не выйшлі з зямлі, спажываюць у ежу. Харч., дэкар., меданосныя расліны. *А.М.Скуратовіч.*



Спаржа лекавая.

СПАРО́ЎВАННЕ ЖЫВЁЛ сельскагаспадарчых, злучка, спосаб натуральнага асемянення матак. Адбываецца ў перыяд палавой ахвоты ў матак. Тып С.ж. залежыць ад віду жывёлы, кірунку іх прадукцыйнасці, памераў і складу статка. Выкарыстоўваюць С.ж. вольнае (вытворнікі самастойна знаходзяць у статку самак у ахвоце і пакрываюць іх); у конегадоўлі касячнае (трымаюць жарабца-вытворніка на 20—25 матак) і варкавое (вытворніка на некалькі гадзін запускаюць у варок да кабыл); у авечкагадоўлі класнае (падбіраюць групу авечак і асемяняюць іх на пашы вызначанымі вытворнікамі); ручное С.ж. праводзіцца пад кантролем чалавека.

СПА́РТА (Sparte), Лакедэмон, старажытнагрэчаскі *поліс* у даліне р. Эўрот (вобл. *Лаканія*), у 6—1 ст. да н.э. — дзяржава ў паўд. частцы п-ва Пелапанес. Да 13 ст. да н.э. на тэр. С. знаходзіліся мікенскія паселішчы. Паводле паэмы «Іліяда» С. была адной з 12 ахейскіх абшчын Лаканіі, якімі валодаў цар Менелай. У час уварвання дарыйцаў (каля 12 ст. да н.э.) мікенскія гарады, у т.л. і С., разбураны. Новая, дарыйская, С. ўзнікла ў 10—9 ст. да н.э., верагодна, у выніку зліцця (*сінайкізму*) ахейскай і дарыйскай абшчын. С. належала да аграрных полісаў — паселішчаў без гарадскіх муроў. Уся зямля была падзелена на 9—10 тыс. клераў (надзелаў) і перадавалася ў спадчыннае карыстанне сем'ям спартыятаў (паўнапраўных грамадзян). Зямлю апрацоўвалі бяспраўныя *ілоты*. Гандлем і рамяством у С. займаліся *перыэкі* (асабіста свабодныя, але пазбаўленыя паліт. правоў).

Спартыяты займаліся толькі ваен. справай, выхоўвалі дзяцей ва ўмовах суровага быту і жорсткай ваен. дысцыпліны (гл. *Спартанскае выхаванне*). Выезд паза межы С. быў магчымы толькі па спец. дазволе. На чале дзяржавы стаялі 2 цары, уладу якіх абмяжоўвалі *герусія* (рада старэйшын) і калегія эфораў (выбіраліся штогод на нар. сходзе — апэле). У грэч. каланізацыі С. практычна не ўдзельнічала. У 8—6 ст. да н.э. пасля працяглай барацьбы С. захапіла суседнія вобласці Месенію і Кінурыю. У выніку барацьбы з Аргасам, Тэгеяй і інш. полісамі ў 2-й пал. 6 ст. да н.э. С. ўзначаліла *Пелапанескі саюз*. У пачатку *грэка-персідскіх войнаў* 500—449 да н.э. яна фармальна стаяла на чале абарончага саюза грэч. дзяржаў, але паступова выйшла з вайны. Пасля перамогі ў *Пелапанескай вайне* 431—404 да н.э. С. дамаглася гегемоніі над усёй Грэцыяй. Падтрымка алігархічных рэжымаў, умяшанне ва ўнутр. справы грэч. полісаў прывялі да Карынфскай вайны 395—387 да н.э. У вайне з Фівамі і іх саюзнікамі С. была пераможана і страціла Месенію. У 362 да н.э. Пелапанескі саюз распаўся. Спробы цароў Агіса IV і Клеамена III у 3 ст. да н.э. правесці сац. рэформы і аднавіць магутнасць С. скончыліся беспаспяхова. У 146 да н.э. С. трапіла пад уладу Рыма, з 27 да н.э. ў складзе рым. правінцыі Ахая. У 395 н.э. разбурана готамі.

Літ.: Андреев Ю.В. Спарта как тип полиса // Античная Греция: Пробл. развития полиса. М., 1983. Т. 1; Корзун М.С. Гісторыя старажытнай Грэцыі. Мн., 1999; Печатнова Л.Г. История Спарты: (Период архаики и классики). СПб., 2001. *А.Г.Зельскі.*



Да арт. **Спарта**. Спартанскі гапліт у 500 да н.э. Рэканструкцыя.

СПАРТА́К (Spartacus; ?—71 да н.э.), правадыр найбуйнейшага паўстання рабоў у Стараж. Рыме, якое ў гістарыяграфіі атрымала назву *Спартака паўстанне*. Паходзіў з Фракіі з племя медаў. Паводле *Апіяна* і *Плутарха*, быў прададзены ў рабства і трапіў у гладыятарскую школу ў Капуі. Разам з групай паплечнікаў уцёк на Везувій, акружаны рымлянамі, вырваўся з дапамогай ваен. хітрасці. З паўстанцаў арганізаваў армію на рым. ўзор са строгай дысцыплінай. У арміі былі наладжаны выраб зброі і вайсковае навучанне. С. не абвяшчаў сябе царом, усе справы, верагодна, вырашалі рада камандзіраў і вайсковы сход; здабыча дзялілася пароўну. Загінуў у бітве з рым. арміяй Краса. Помнік у Балгарыі.

Літ.: Мишулин А.В. Спартак. [2 изд.]. М., 1950; Лесков В. Спартак. Ростов на/Д; М., 1997. *А.Г.Зельскі.*



Да арт. **Спарта**. Бронзавая статуэтка спартанскага воіна. Канец 6 ст. да н.э.

«СПАРТА́К», спартыўнае таварыства прафсаюзаў у 1935—93. Аб'ядноўвала работнікаў асветы, аўтатранспарту, аховы здароўя, грамадз. авіяцыі, дзярж. гандлю, дзярж. устаноў, жыллёва-камунальнай гаспадаркі, культуры, лёгкай і харч. прам-сці, спажывецкай кааперацыі, сувязі і інш.

Створана ў 1935 як усесаюзнае добраахвотнае фізкультурна-спарт. т-ва работнікаў прамысл. кааперацыі на аснове фізкультурных гуртковў. У 1960 рэарганізавана ў спарт. т-ва прафсаюзаў (12 галіновых прафсаюзаў). Будавалася паводле тэрытарыяльна-вытв. прынцыпу і мела пярвічныя арг-цыі — калектывы фіз. культуры і спарт. саветы (рэсп., краявыя, абл., гар.).

На Беларусі рэсп. савет аб'ядноўваў 6 абл. і 18 гар. спарт. саветаў. Т-ва мела (1981) 36 дзіцяча-юнацкіх спарт. школ, 8 стадыёнаў, 30 футбольных палёў, 99 спарт. залаў, 102 лыжныя базы, 65 спарт.-аздараўленчых лагераў; культываваліся 40 відаў спорту. У 1985 на базе некалькіх спарт. т-ваў, у т.л. і «С.», створана адзінае добраахвотнае фізкультурна-спарт. т-ва прафсаюзаў; у 1993 раз'яднана на шэраг фізкультурна-спарт. клубаў.

СПАРТАКА́ ПАЎСТА́ННЕ, найбуйнейшае паўстанне рабоў у Стараж. Рыме ў 73 (ці 74) — 71 да н.э. Пачалося са змовы ў школе гладыятараў у Капуі. Гладыятары на чале са *Спартаком*, Крыксам і Энамаем утварылі на Везувіі ўмацаваны лагер, які папаўняўся за кошт рабоў і сельскай беднаты. Хутка атрад (каля 70 чал.) ператварыўся ў 10-тысячную армію. Пасланыя супраць паўстанцаў атрады рымлян (напачатку 3 тыс., пасля 10 тыс. чал.) былі разбіты. Паўстанне ахапіла паўд. вобласці Італіі. У 72 да н.э. рым. сенат накіраваў супраць паўстанцаў 2 консульскія арміі. У бітве каля Гарганскай гары рымляне знішчылі 30-тысячны атрад Крыкса, які аддзяліўся ад асн. арміі Спартака. Скарыстаўшы раз'яднанасць рым. армій, войска Спартака разбіла іх. Паўстанцы прайшлі праз усю Італію, у бітве каля Муціны (Паўн. Італія) разбілі армію праконсула Касія і павярнулі на Пд. Нанава набраную армію Рыма ўзначаліў *Ліцыній Крас*. Ён праследаваў армію паўстанцаў, не пачынаючы рашаючай бітвы. Спартак дамовіўся з піратамі пераправіцца на іх караблях у Сіцылію. Аднак, калі армія Спартака дайшла да Месінскага праліва, абяцаных караблёў не было. Спартак прарваўся праз умацаванні Краса, страціўшы каля $^2/_3$ арміі. Спадзеючыся пераправіцца ў Грэцыю, паўстанцы скіраваліся да Брундызія. Рым. сенат накіраваў супраць іх арміі Гнея Пампея і Марка Лукула. Асцерагаючыся аб'яднання рым. армій, Спартак даў рашаючы бой арміі Краса на мяжы Апуліі і Луканіі (вясна 71 да н.э.), але быў разбіты; сам ён загінуў у баі. Каля 6 тыс. палонных рабоў былі распяты ўздоўж Апіевай дарогі.

Літ.: Мишулин А.В. Спартаковское восстание. М., 1936; Карышковский П.О. Восстание Спартака. М., 1958; Хёфлинг Г. Римляне, рабы, гладиаторы: Спартак у ворот Рима: Пер. с нем. М., 1992. *А.Г.Зельскі.*

«СПАРТАКА́ САЮ́З» («Spartakusbund»), арганізацыя германскіх леварадыкальных сацыял-дэмакратаў, якая існавала ў пач. 20 ст. Пераемнік узнікшай на мяжы 1915—16 унутры *Сацыял-дэмакратычнай партыі Германіі* леварадыкальнай групы вакол Р.*Люксембург*, К.*Лібкнехта* і Ф.Мерынга (з 1916 наз. «Група Спартак»; з крас. 1917 у складзе *Незалежнай сацыял-дэмакратычнай партыі Германіі*, НСДПГ). Утвораны 11.11.1918 у час *Лістападаўскай рэвалюцыі 1918* у Германіі на базе «Групы Спартак». Выступаў за радыкалізацыю рэвалюцыі (укараненне сістэмы саветаў і інш.), удзельнічаў у арганізаваным ім няўдалым паўстанні («Паўстанне Спартака») у снеж. 1918 — студз. 1919. Пасля выхаду з НСДПГ (снеж. 1918) спартакісты і інш. заснавалі 30.12.1918—1.1.1919 Камуніст. партыю Германіі.

СПАРТАКІ́ДЫ (грэч. Spartokidai), дынастыя правіцеляў *Баспорскай дзяржавы* ў 438—107 да н.э. Засн. Спартакам I [438—433 да н.э.]. С. былі буйнымі землеўладальнікамі, гандлявалі збожжам з Афінамі. Найб. значныя іх прадстаўнікі: Сатыр I [433—388 да н.э.], Леўкон I [388—348 да н.э.], Перысад I [348—310 да н.э.]. У час іх кіравання тэрыторыя і ўплыў царства пашырыліся на памежныя вобласці скіфскіх, меоцкіх і сіндскіх плямён. Дынастыя спыніла існаванне ў выніку *Саўмака паўстання* (107 да н.э.). *А.Г.Зельскі.*

СПАРТАКІ́ЯДА, комплексныя спаборніцтвы па розных відах спорту. Назва ад імя *Спартака*.

Пачалі праводзіцца ў пач. 1920-х г. у СССР і некат. краінах Еўропы (Германія, Чэхаславакія). І Усесаюзная С. адбылася ў 1928 (Масква), у ёй удзельнічалі спарт. дэлегацыі рэспублік СССР і прадстаўнікі спарт. арг-цый 17 краін. У 1930-я г. пачалі праводзіцца С. прафсаюзаў, добраахвотных т-ваў «Дынама», «Спартак», Узбр. Сіл СССР і інш.; з 1951 — студэнцкія С., з 1954 — С. навучэнцаў школ і вучылішчаў. У 1956—86 раз у 4 гады праводзіліся летнія С. народаў СССР, у 1962—86 — зімовыя.

І Усебел. С. прайшла ў ліп. 1928 (адборачны этап Усесаюзнай С.). З 1929 праводзілі Усебел. сельскія С., С. школьнікаў і інш. І летняя С. Беларусі (этап С. народаў СССР) адбылася ў 1956 па 19 відах спорту, І зімовая — у 1961/62. На С. народаў СССР зборныя каманды Беларусі займалі месцы: 7-е на I (1956); 6-е на II (1959), III (1963), IV (1967); 4-е на V (1971); 5-е на VI (1975); 4-е на VII (1979); 5-е на VIII (1983).

Літ.: Сазанович В.П., Кулинкович К.А., Филиппович В.С. Физическая культура и спорт Белоруссии. Мн., 1988.

Я.К.Кулінковіч.



Спартан.

СПАРТА́Н, канадскі позназімовы сорт яблыні. Выведзены ад скрыжавання сартоў Мекінтош і Жоўты Ньютаўн. Пашыраны на Беларусі.

Дрэва сярэднярослае, крона круглавата-цыліндрычнай формы. Плады сярэдняй велічыні (80—90 г), амаль аднамерныя, круглавата-канічнай формы. Асн. афарбоўка светла-зялёная, покрыўная — цёмна-бардовая з фіялетавым адценнем. Мякаць белая, шчыльная, сярэднесакаўная, кіславата-салодкага смаку. Плоданашэнне пачынае на 3—4-ы год, дае рэгулярны сярэдні ўраджай, які выспявае ў канцы вер., захоўваецца да мая. Зімаўстойлівасць сярэдняя, сярэднеўстойлівы да паршы.

СПАРТА́НСКАЕ ВЫХАВА́ННЕ, дзяржаўная сістэма выхавання і навучання, якая існавала ў 8—4 ст. да н.э. ў *Спарце* (Стараж. Грэцыя) з мэтай падрыхтоўкі фіз. развітых, вынослівых, смелых, валявых, рашучых і дысцыплінаваных воінаў. Выхаванне вялося ў дзярж. інтэрнатах ваен. тыпу. Вучні падзяляліся на 2 групы: малодшыя (хлопчыкі 7—14 гадоў) і эфебы (юнакі 14—20 гадоў). Уключала сістэму разнастайных фіз. практыкаванняў, загартоўванне, навучанне вайск. майстэрству, а таксама чытанню, пісьму, выразнай мове, харавым спевам, ігры на муз. інструментах. Ужываліся фіз. пакаранні. С.в. прадугледжвала ўсебаковае фіз. выхаванне і для дзяўчынак. Яны дадаткова вучыліся спевам і танцам; у адрозненне ад хлопчыкаў выхоўваліся не ў інтэрнатах, а ў сям'і. У пераносным сэнсе С.в. называюць сістэму выхавання, якая фарміруе вынослівасць, стойкасць, здольнасць пераносіць цяжкасці і нягоды. *Т.І.Адула.*

СПАРТЫ́ЎНА-ГІМНАСТЫ́ЧНАЯ ЗА́ЛА, спецыяльнае памяшканне для заняткаў гімнастыкай. Памеры адвольныя. Абсталёўваецца гімнастычнымі снарадамі, гімнастычнай («шведскай») сценкай, шастамі, канатамі, бумамі, лесвіцай для лажання і інш. Побач са С.-г. з. ствараюцца дапаможныя і падсобныя памяшканні: раздзявальні, душавыя, антрапаметрычны кабінет і інш.

СПАРТЫ́ЎНАЕ АРЫЕНТАВА́ННЕ, від спорту; гл. ў арт. *Арыентаванне*.

СПАРТЫ́ЎНАЕ РЫБАЛО́ЎСТВА, тое, што *рыбалоўны спорт*.

СПАРТЫ́ЎНА-СТРАЛКО́ВЫ КО́МПЛЕКС імя маршала Сав. Саюза С.К.Цімашэнкі, спартыўнага камітэта Міністэрства Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, асноўная база падрыхтоўкі нац. зборных каманд па стралк. спорце. Пабудаваны ў Мінску ў 1972 (рэканструяваны ў 1978); пл. 12 га.

Мае гал. павільён для стральбы з 4 закрытымі цірамі (10-, 25- і 50-метровыя, 10-метровы «бягучы дзік») і адкрытыя ціры (25-, 50- і 300-метровыя, 4 асобныя 50-метровыя «бягучы дзік», цір для стэндавай стральбы з 2 круглымі і 1 траншэйным стэндамі). Ціры абсталяваны для стральбы з усіх відаў спарт. стралк. зброі. Маюць мех. і электронныя ўстаноўкі з дыстанцыйным кіраваннем. Інфармацыя пра вынікі стральбы выдаецца на электроннае табло. Праводзяцца міжнар. і рэсп. спаборніцтвы.

СПАРТЫ́ЎНА-ТЭХНІ́ЧНЫ КЛУБ (СТК), вучэбна-спартыўная арганізацыя па *тэхнічных відах спорту*. Як метадычны цэнтр развіцця тэхн. відаў спорту праводзіць работу па падрыхтоўцы дапрызыўнікаў да ваен. службы, асваенні моладдзю масавых тэхн. прафесій. На Беларусі з'яўляюцца структурнымі падраздзяленнямі *Беларускага абароннага спартыўна-тэхнічнага таварыства*. Уключаюць 3 рэсп. СТК: па аўтамотаспорце (засн. ў 1970), па водных відах спорту (1977) і радыёспорце (1978), а таксама 58 раённых і гар. СТК (2002). Гл. таксама *Спартыўны клуб*.

СПАРТЫ́ЎНАЯ ГІМНА́СТЫКА, практыкаванні і спаборніцтвы на гімнастычных снарадах, у апорных скачках і ў вольных практыкаваннях; від спорту. У праграму гімнастычнага многабор'я ўваходзяць адвольныя практыкаванні: для мужчын — у апорных скачках, у вольных практыкаваннях, на кані, кольцах, брусах і перакладзіне; для жанчын — на брусах рознай вышыні, бервяне, у апорных скачках і вольных практыкаваннях.

Гімнастычныя практыкаванні ўваходзілі ў сістэму фіз. выхавання з часоў Стараж. Грэцыі. Практыкаванні на гімнастычных снарадах, апорныя скачкі выкарыстоўваліся ў сістэме фіз. выхавання ў еўрап. краінах з канца 18 — пач. 19 ст. Спаборніцтвы праводзяцца з 2-й пал. 19 ст. Міжнар. федэрацыя гімнастыкі створана ў 1881. З 1896 С.г. ўваходзіць у праграму Алімп. гульняў (жанчыны ўдзельнічаюць з 1928). Чэмпіянаты свету адбываюцца з 1903 (у жанчын — з 1934). Найб. пашырана С.г. на Беларусі, у Германіі, ЗША, Кітаі, Расіі, Украіне, Японіі і інш.

На Беларусі С.г. развіваецца з канца 19 — пач. 20 ст. Заняткі гімнастыкай з 1889 уваходзілі ў вучэбныя праграмы настаўніцкіх семінарый (г. Маладзечна, Нясвіж, Полацк, мяст. Свіслач); як элемент агульнафіз. падрыхтоўкі — у школьныя праграмы. У 1909 у г. Гродна створана гімнастычнае т-ва «Сокал». У 1910—14 у г. Вільня, Гродна, Магілёў, Слуцк і інш. праходзілі гімнастычныя святы вучнёўскай моладзі. На пачатак 1914 мелася каля 50 спарт. і гімнастычных арг-цый. І Усебел. зімовае гімнастычнае свята праведзена ў 1933. Найб. інтэнсіўна С.г. развівалася з 1950-х г. З пач. 1960-х г. складалася бел. жаночая гімнастычная школа (трэнеры Р.С.*Ваткін*, В.Дз.*Дзмітрыеў*, Р.І.*Кныш* і інш.). Пазней склалася і мужчынская бел. гімнастычная школа. На Беларусі праводзіліся міжнар. спаборніцтвы па С.г., у т.л. чэмпіянат Еўропы (1971). Мужчынская зборная каманда Беларусі — чэмпіён (2001) і бронз. прызёр (1999) чэмпіянатаў свету, чэмпіён (1994) і бронз. прызёр (1996) чэмпіянатаў Еўропы. Сярод бел. гімнастаў найб. вызначыліся І.*Іванкоў*, М.*Мілігула*, В.*Шчэрба*, А.Кан, А.Малееў, В.Рудніцкі, У.Шчукін і інш.; сярод гімнастак — Т.*Аржаннікава*, С.*Багінская*, С.*Баітава*, А.*Валчэцкая*, Н.*Кім*, В.*Корбут*, А.*Кошаль*, Т.*Лазаковіч*, Л.*Петрык*, А.Піскун і інш. *А.М.Петрыкаў.*

СПАРТЫ́ЎНАЯ ЗБРО́Я, ручная агнястрэльная або пнеўматычная зброя для спарт. стральбы па нерухомых і рухомых цэлях. Бывае наразная і гладкаствольная, адназарадная і магазінная, неаўтаматычная і самазарадная.

Наразная С.з. ўключае вінтоўкі і пісталеты (рэвальверы) малога (звычайна 5,6 мм) і нармальнага калібру. Падзяляецца на мэтавую (адвольнага ўзору) і спартыўную (стандартную). Гладкаствольная С.з. выкарыстоўваецца ў стэндавай стральбе шротам па цэлях, якія ляцяць, — талерачках.

СПАРТЫ́ЎНАЯ КЛАСІФІКА́ЦЫЯ, сістэма прысваення *спартыўных званняў* і разрадаў на падставе вынікаў, паказаных спартсменамі ў афіц. спаборніцтвах. Ажыццяўляецца адпаведнымі нац. і міжнар. спарт. федэрацыямі і арг-цыямі. Аб'ядноўвае нормы і патрабаванні па ўсіх відах спорту, у т.л. і для спарт. суддзяў. Разрадныя нормы вызначаюцца часам, даўжынёй, масай і інш. паказчыкамі, або спартсмен павінен заняць пэўнае месца на спаборніцтвах ці атрымаць перамогу над сапернікам, які мае пэўны спарт. разрад або званне. З 1935 да пач. 1990-х г. у СССР дзейнічала Адзіная ўсесаюзная спарт. класіфікацыя.

СПАРТЫ́ЎНАЯ МЕДЫЦЫ́НА, галіна *медыцыны*, якая вывучае ўплыў фізкультуры і спорту на здароўе, фіз. развіццё і функцыян. магчымасці арганізма чалавека. Асн. кірункі: функцыян. дынамічная анатомія (марфал. змены ў мышачнай, касцявой і інш. сістэмах пад уплывам спарт. нагрузак); фізіялогія фіз. практыкаванняў і спорту (змены дзейнасці розных сістэм і органаў пад уплывам спарт. нагрузак); біяхімія спорту (складаныя біяхім. працэсы ў арганізме спартсменаў); гігіена фізкультуры і спорту; спартыўныя кардыялогія, траўматалогія, фармакалогія і інш. Вывучае таксама паталаг. змены дзейнасці сістэм арганізма чалавека пры нерацыянальных трэніроўках, распрацоўвае прафілакт., лячэбныя і рэабілітацыйныя мерапрыемствы, удасканальвае метады дыягностыкі функцыян. сістэм асоб рознага ўзросту, якія займаюцца фізкультурай і спортам.

Літ.: Спортивная медицина. 2 изд. М., 1987; Майкели Л., Дженкинс М. Энциклопедия спортивной медицины: Пер. с англ. СПб., 1997.

СПАРТЫ́ЎНАЯ ФЕДЭРА́ЦЫЯ, міжнародная (сусв., рэгіянальная) або нацыянальная арганізацыя (аб'яднанне) па пэўным відзе спорту. Міжнар. С.ф. складаецца з нац. (часам і міжнар.) спарт. арг-цый, устаноў і асобных грамадзян. Можа прадстаўляць аматараў і прафесіяналаў. Асн. задачы С.ф.: планаванне, садзейнічанне і каардынацыя работы па развіцці і прапагандзе пэўнага віду спорту; павышэнне майстэрства спартсменаў; распрацоўка, удасканаленне, зацвярджэнне спарт. рэгламенту і правіл; арг-цыя спаборніцтваў; забеспячэнне прадстаўніцтва ў спарт. арг-цыях вышэйшага ўзроўню і інш. У адпаведнасці з *Алімпійскай хартыяй* міжнар. С.ф., прызнаныя Міжнар. алімп. к-там, ажыццяўляюць тэхн. кіраўніцтва алімп. спаборніцтвамі па сваіх відах спорту, у т.л. і дзейнасцю судзейскага апарату.

Міжнар. С.ф. склаліся ў канцы 19 — пач. 20 ст. (веславання, гімнастыкі і інш.). У 1960-я г. створана Ген. асацыяцыя міжнар. С.ф. (кансультатыўная арг-цыя). Па асобных відах спорту існуе больш за 100 міжнар. С.ф., на Беларусі больш за 90 (2001).



Спартыўная зброя. 1 — дробнакаліберная стандартная вінтоўка; 2 — дробнакаліберная адвольная вінтоўка; 3 — пнеўматычная вінтоўка; 4 — стэндавы пісталет; 5 — стэндавы рэвальвер.

СПАРТЫ́ЎНЫ АЎТАМАБІ́ЛЬ, від *легкавога аўтамабіля*, абсталяванага для заняткаў *аўтамабільным спортам*. Адрозніваюць С.а. дарожнага тыпу і спецыяльныя.

Бываюць 2- і 4-месныя з адкрытым ці закрытым кузавам. На С.а. устанаўліваюць выбухабяспечны паліўны бак, рамяні бяспекі, асобныя прыводы тармазоў задніх і пярэдніх колаў і інш. С.а. дарожнага тыпу выпускаюцца на базе серыйных аўтамабіляў і ў параўнанні з імі маюць рухавікі павялічанай магутнасці, палепшаныя дынамічныя якасці, павышаную ўстойлівасць і інш. Прызначаны для спаборніцтваў на горных трасах, ралі і інш. Спецыяльныя С.а. вырабляюць з выкарыстаннем толькі асобных вузлоў і дэталей серыйных аўтамабіляў. Прызначаны для шашэйна-кальцавых гонак на вял. дыстанцыі (на кароткіх дыстанцыях карыстаюцца *гоначнымі аўтамабілямі*).

СПАРТЫ́ЎНЫ ІНВЕНТА́Р І АБСТАЛЯВА́ННЕ. Вырабляюцца па стандартах, зацверджаных міжнар. або нац. (для нац. відаў спорту) спарт. федэрацыямі і зарэгістраваныя ў міжнар. арг-цыях. Асн. групы: адзенне (форма), абутак, снарады (апараты), інвентар і апаратура для абсталявання спарт. збудаванняў і абслугоўвання спаборніцтваў.

Існуе больш за 200 відаў спарт. адзення і больш за 60 відаў абутку, прызначаных для трэніровак і спаборніцтваў. Яны павінны адпавядаць спартыўна-гігіенічным і эстэт. патрабаванням. У некат. відах спорту (напр., у аўта- і мотаспорце, гарналыжным, падводным, фехтаванні, хакеі і інш.) састаўной ч. вопраткі-формы з'яўляецца ахоўны і засцерагальны рыштунак: акуляры, маскі, пальчаткі (у т.л. баксёрскія), шлемы, камізэлькі, цяжкаатлетычныя паясы і інш. Асобныя віды спарт. абутку таксама маюць спец. прылады: амартызатары, накладкі, узмацняльнікі, шыпы і інш. Да спарт. снарадаў адносяць: біты для спарт. гульняў, клюшкі, мячы, ракеткі, спарт. зброю (наразныя і пнеўматычныя вінтоўкі, пісталеты, стэндавыя ружжы, лукі, шаблі, рапіры, шпагі), лёгкаатлетычныя дыскі, коп'і, молаты, ядры, шасты, цяжкаатлетычныя штангі і гіры, гімнастычныя брусы, бумы, кольцы, перакладзіны і інш., а таксама абручы, мячы, скакалкі, стужкі для маст. гімнастыкі, батуты, канькі (бегавыя, для фігурнага катання, ролікавыя, хакейныя), лыжы (водныя, гоначныя, горныя, скачковыя) і інш. Да спарт. снарадаў адносяць таксама трэнажоры, катапульты, цэнтрыфугі, эспандэры і інш. комплексныя трэніровачныя апараты. Асобную групу складаюць снарады-апараты: веласіпеды (горныя, трэкавыя, шашэйныя, тандэмы), матацыклы (іпадромныя, кросавыя, рэкордна-гоначныя, шашэйныя), аўтамабілі (багі, карты, рэкордна-гоначныя і інш.), лодкі (акад. судны, байдаркі, каноэ), скутэры, яхты, буеры, санкі, планёры, спарт. самалёты. Спарт. абсталяванне ўключае рознага тыпу вароты, сеткі, стойкі, шчыты, баксёрскія рынгі, барцоўскія і гімнастычныя дываны, памосты, інш. прылады для аснашчэння спарт. арэн. Да спарт. абсталявання ў шырокім сэнсе адносяць таксама судзейска-інфарм. і медыка-біял. апаратуру, спец. тэхніку для абслугоўвання спарт. збудаванняў (велаэргометры, газааналізатары, фотафінішы, электракардыёграфы, эл. і электронныя табло і інш.), лёдаўборачныя камбайны, бугельныя і крэславыя пад'ёмнікі для гарналыжнікаў, рат-

ракі-трактары з навясным абсталяваннем для падрыхтоўкі лыжных трас, абсталяванне для вырабу штучнага снегу і інш. Буйнейшыя вытворцы спарт. інвентару: фірмы «Адзідас», «Берг», «Пума» (Германія), «Фішэр», «Кэстле» (Аўстрыя), «Данлап», «Умбра» (Вялікабрытанія), «Карху», «Коха» (Фінляндыя), «Рыбак», «Найк» (ЗША) і інш. *А.М.Петрыкаў.*

СПАРТЫЎНЫ КАМІТЭ́Т Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, ведамасны рэспубліканскі орган, прызначаны для арганізацыі фіз. культуры і спорту ва Узбр. Сілах. Аказвае практычную і метадычную дапамогу вайсковым часцям у арг-цыі і правядзенні спарт.-масавай работы і ў падрыхтоўцы спартсменаў.

Бярэ пачатак ад спарт. аддзялення, створанага ў жн. 1944 пры Доме афіцэраў БВА. З крас. 1946 спарт. клуб Дома афіцэраў, з мая 1953 спарт. клуб арміі (СКА) БВА, з кастр. 1992 — Спарт. клуб Мін-ва абароны Рэспублікі Беларусь, са жн. 1995 сучасная назва. З 1993 С.к. прадстаўляе Узбр. Сілы Рэспублікі Беларусь у Міжнар. савеце ваен. спорту (створаны ў 1948, аб'ядноўвае ваеннаслужачых-спартсменаў 122 краін свету).

С.к. мае неабходную спарт. базу: палац лёгкай атлетыкі, спарт. базу ва Уруччы (4-залавы спарт. комплекс, зал барацьбы і цяжкай атлетыкі, 50-метровы адкрыты плавальны басейн і інш.), спарт.-стралк. комплекс, Мінскую (плавальны басейн, зала гімнастыкі) і Гродзенскую (зала гімнастыкі) спарт. базы. Працуе аб'яднаная спецыялізаваная дзіцяча-юнацкая школа алімпійскага рэзерву (з аддзяленнямі па спарт. гімнастыцы, лёгкай атлетыцы, плаванні, кулявой стральбе, тэнісе, фехтаванні). З сярэдзіны 1970-х г. вучыцца каля 600 дзяцей і падлеткаў ва ўзросце ад 6 да 18 гадоў. У розныя гады ў С.к. праходзілі і праходзяць службу вядомыя спартсмены: А.У.*Валчэцкая*, М.П.*Мілігула*, В.В.*Корбут*, Н.У.*Кім*, В.А.*Сідзяк*, М.А.*Алёхін*, І.М.*Жалязоўскі*, А.У.*Каршакевіч*, І.М.*Басінскі* і інш. *В.А.Данілаў.*

СПАРТЫЎНЫ КЛУБ, арганізацыя, якая аб'ядноўвае спартсменаў і аматараў спорту. Ажыццяўляе падрыхтоўку спартсменаў высокай кваліфікацыі, удзельнічае ў арганізацыі і правядзенні спаборніцтваў. Адрозніваюць С.к. аматарскія, бюджэт якіх складаецца гал. чынам з прафсаюзных адлічэнняў, арэнднай платы за карыстанне спарт. збудаваннямі, членскіх узносаў, і прафесійныя, якія фінансуюцца прадпрымальнікамі, фірмамі, акцыянернымі кампаніямі і інш. і з'яўляюцца камерцыйнымі арг-цыямі прафесійнага спорту.

Аматарскія С.к. ўзніклі ў 17—18 ст. у Вялікабрытаніі. У канцы 19 — пач. 20 ст. ў многіх краінах арганізаваны футбольныя і інш. С.к. У Расіі С.к. створаны ў Пецярбургу (у 1846 — імператарскі, у 1860 — рачны яхт-клуб, клуб спарт. гульняў і інш.) і ў Маскве (1846 — рачны яхт-клуб). У 1923 рас. С.к. распушчаны, а ў 1920—30-я г. створаны С.к. прафсаюзаў, Узбр. сіл і добраахвотнага т-ва садзейнічання арміі, авіяцыі і флоту (ДТСААФ).

На Беларусі прафсаюзныя С.к. арганізаваны ў 1960—70-я г.: «МАЗ» і «Трактар» (1961), «Камвольшчык» (1964), «Матор» (1973) у Мінску; «Дзвіна» (1963) у Віцебску, «Гомсельмаш» (1963), «Алмаз» (1978) у Гомелі; «Днепр» (1978) у Магілёве, і інш. Дзейнічалі С.к. ў ВНУ, некат. тэхнікумах, БВА, ДТСААФ (6 рэсп. клубаў), розныя *спартыўна-тэхнічныя клубы* і інш.

СПАРТЫ́ЎНЫ ПЕРЫЯДЫ́ЧНЫ ДРУК Беларусі, газеты і часопісы спарт. тэматыкі. На Беларусі першыя спарт. выданні — «Физкультурник» (1925—26), «Бюллетень Высшего совета физической культуры» (1925). Найб. вядомыя ў наш час мінскія газеты: «*Спортивная панорама*» і «*Прессбол. Такова спортивная жизнь*», «Всё о футболе» (з 1999); рэгіянальныя «Спорт-тур-пресс» (г. Гродна), «Футбольный клуб» і «Футбол Гомельшины» (г. Гомель), «Футбольный курьер» (г. Бабруйск). Часопісы: міжнар. спарт. «Олимп» (з 1996); рэсп. — «Кэмпо: Боевые искусства сегодня и вчера» (з 1992), «Спорт на воде» (з 1993) і інш.

СПАРТЫ́ЎНЫ ТА́НЕЦ, від спорту, які спалучае танец (як від мастацтва) з элементамі спарт. спаборніцтва. Складаецца з праграм: еўрапейскай (павольны вальс, танга, венскі вальс, павольны факстрот і квікстэп) і лацінаамерыканскай (самба, ча-ча-ча, румба, пасадобль і джайв).

Спаборніцтвы па С.т. праводзяцца з 1920-х г. Аматарская арг-цыя С.т. засн. ў 1935, Міжнар. савет танцараў-аматараў — у 1957 (з 1990 Міжнар. федэрацыя танц. спорту, МФТС). Аб'ядноўвае 79 краін свету (2001). Чэмпіянаты свету і Еўропы праводзяцца штогод з 1957.

На Беларусі развіваецца з 1960-х г. Федэрацыя С.т. створана ў 1988, у 1990 увайшла ў склад МФТС. Сярод бел. танцараў-спартсменаў найб. вызначыліся: удзельнікі чэмпіянатаў свету і Еўропы А. і Ю. Царовы, П. і І. Піліпенчукі; 3-разовыя чэмпіёны Беларусі, майстры міжнар. класа С.Халадкоўская і Р.Ярмаковіч; чэмпіёны рэспублікі: В.Бушуева і А.Бушчык, П.Паўлінава і М.Дубоўскі, А.Феакцістава і А.Кукарэка, ансамбль танц. клуба «Мара» (2001), а таксама лаўрэаты конкурсаў і фестываляў Л.Лазарава, В.Кляонскі, Р.Чэхава, Я.Лемберг, Н. і М. Біруны, Н. і Б. Паповы, Т. і М. Паўлінавы, Ж. і У. Шалькевічы. *А.М.Паўлінава, М.І.Паўлінаў.*

СПАРТЫ́ЎНЫЯ ГУ́ЛЬНІ, віды гульнявых спаборніцтваў, асновай якіх з'яўляюцца розныя тэхн. і тактычныя спосабы дасягнення пэўнай мэты ў проціборстве паміж камандамі ці асобнымі спартсменамі. Змест і арганізацыя С.г. абумоўліваюцца афіц. правіламі, якія вызначаюць мэту, працягласць гульні, колькасць удзельнікаў, памеры пляцоўкі, парадак вызначэння пераможцы і інш. Паводле характару дзеянняў С.г. падзяляюць на групы: з кантактным процідзеянням сапернікаў, накіраваныя на пападанне, напр., мяча ў вароты, карзіну або ў пэўную адзнаку (*баскетбол, рэгбі, футбол* і інш.); з бескантактным процідзеяннем, з ударамі ў адказ (*бадмінтон, валейбол, сквош, тэніс* і інш.); з умоўным процідзеяннем, якое прадугледжвае пачарговае пападанне сапернікаў у цэль (*бейсбол, більярд, гарадкі*, дартс і інш.). Да С.г. адносяць таксама брыдж, *шахматы, шашкі.*

Узніклі з нар. гульняў і забаў (напр., гарадкі, тэніс, футбол), некаторыя распрацаваны спецыялістамі (напр., валейбол, *гандбол*) або сфарміраваліся як разнавіднасці існуючых (напр., *міні-футбол*, пляжны валейбол). Уваходзяць у праграмы Алімп. гульняў, рэгіянальных і інш. комплексных спаборніцтваў (напр., *Панамерыканскія гульні*, універсіяды і спартакіяды); па іх праводзяцца чэмпіянаты свету, кантынентаў, краін і г.д. Гл. таксама *Беларускія народныя гульні.* *Я.К.Кулінковіч.*

СПАРТЫ́ЎНЫЯ ЗБУДАВА́ННІ, спецыяльна пабудаваныя і адпаведна абсталяваныя збудаванні для аздараўленчых і вучэбна-трэніровачных заняткаў і спаборніцтваў па розных відах спорту.

Першыя С.з. — ант. стадыёны, іпадромы, амфітэатры, цыркі Стараж. Грэцыі і Рыма. Распаўсюджанне хрысціянства, якое адмаўляла культ гарманічна развітага чалавечага цела, прыпыніла буд-ва С.з. у сярэднія вякі. С.з. 19 ст. ў Зах. Еўропе (басейны, гімнастычныя залы) стылістычна паўтаралі ант. ўзоры. Памеры і арх. асаблівасці робяць сучасныя С.з. моцнымі кампазіцыйнымі акцэнтамі забудовы населенага пункта, мікрараёна, зоны адпачынку і інш. (стадыёны «Маракана» ў Рыо-дэ-Жанейра і «Раздан» у Ерэване, спарт. комплексы «Лужнікі» і «Алімпійскі» ў Маскве і інш.). Адрозніваюць С.з. спецыялізаваныя (велатрэкі, басейны, тэнісныя корты і інш.) і комплексныя (стадыёны, палацы спорту, манежы, комплексныя пляцоўкі, шматзальныя карпусы і інш.). Паводле аб'ёмна-планіровачных вырашэнняў падзяляюцца на адкрытыя і крытыя, паводле прызначэння — для летніх і зімовых відаў спорту, вучэбна-трэніровачныя і дэманстрацыйныя (з трыбунамі для гледачоў). Набылі пашырэнне шматмэтавыя спарт.-відовішчныя збудаванні для спарт.



Да арт. **Спартыўныя збудаванні**. Крыты стадыён спартыўнага комплексу «Алімпійскі» ў Маскве.



Да арт. **Спартыўныя збудаванні**. Лядовы палац спорту ў Гомелі. Архітэктары І.Боўт, С.Міцько.

спаборніцтваў, мітынгаў, сходаў, канцэртаў, кінапаказаў і інш.

На Беларусі будынкі і памяшканні для заняткаў спортам і фізкультурай будавалі з 18 ст. (манежы, фехтавальныя залы). З канца 19 ст. вядомы спец. спарт. залы для барацьбы, цяжкай атлетыкі, велатрэк (Мінск). Актыўнае буд-ва С.з. пачалося ў канцы 1920-х г. (іпадром у Мінску, стадыёны ў Гомелі, Магілёве, Мінску, Оршы; усе знішчаны ў Вял. Айч. вайну). У пасляваен. гады С.з. сталі абавязковай ч. забудовы гарадоў, паркаў культуры і адпачынку, цэнтр. сядзіб калгасаў і саўгасаў, тэрыторый пры навуч. установах. Для буйных рэсп., усесаюзных і міжнар. спаборніцтваў пабудаваны унікальныя С.з., якія вызначаюцца арыгінальнасцю арх. прыёмаў, навізной планіровачна-тэхнал. вырашэнняў: стадыён *«Дынама»* ў Мінску, *Мінскі палац спорту*, спарт. комплексы *«Працоўныя рэзервы»*, *«Раўбічы»*, *«Стайкі»*, *Палац лёгкай атлетыкі* спарт. к-та Узбр. Сіл Беларусі, Палац тэніса ў Мінску (гл. *Нацыянальны цэнтр алімпійскай падрыхтоўкі па тэнісе і настольным тэнісе Рэспублікі Беларусь*), конна-спарт. манеж *«Ратамка»*, *Гомельскі лёгкаатлетычны манеж*, Палац спорту ў Гомелі (1964) і інш. Найчасцей С.з. ўзводзяць паводле індывід. праектаў, з выкарыстаннем спец. канструкцый для перакрыцця вял. (да 56 м) пралётаў. У 2-й пал. 1990-х г. рэалізавана праграма буд-ва ў абл. гарадах палацаў спорту (лядовых палацаў) для спаборніцтваў па фігурным катанні, хакеі і інш.: *Мінскі лядовы палац спорту*, у Брэсце (арх. І.Боўт, В.Шаўчэнка), Віцебску (арх. Боўт, А.Шафрановіч), Гомелі (арх. Боўт, С.Міцько), Гродне (арх. М.Жучко, У.Еўдакімаў, А.Пархута, А.Тараненка), Магілёве (арх. А.Вераценнікаў, М.Гроднікаў, Г.Зыблюк, А.Касаткін). Умяшчальнасць трыбун 3150—2000 месцаў. С.з. вызначаюцца своеасаблівымі планіровачнай структурай, вырашэннем інтэр'ераў і дызайнам, выкарыстаннем найноўшых тэхналогій. Спарт. залы палацаў перакрыты уніфікаванымі фермамі пралётам 48 м пры выш. залы да 12 м (у Мінску — 9 м). Рэканструяваны крыты каток у парку імя М.Горкага (арх. А.Прасяная, Ю.Кузьміна і інш.) і адкрытая лядовая пляцоўка Палаца спорту (арх. Боўт, Шафрановіч) у Мінску. З 1999 ствараецца Нац. алімп. комплекс у Мінску.



Да арт. **Спартыўныя збудаванні**. Палац спорту ў Віцебску. Архітэктары І.Боўт, А.Шафрановіч.



Да арт. **Спартыўныя збудаванні**. Адкрытая лядовая пляцоўка Палаца спорту ў Мінску.

Літ.: Кистяковский А.Ю. Проектирование спортивных сооружений. 2 изд. М., 1980; Филимонов С.Д. Архитектура универсальных зрелищно-спортивных залов. Мн., 1980; Яго ж. Архитектура общественных зданий Белоруссии. Мн., 1985; Спортивная панорама // Архитектура и стр-во. 2000. №4.

С.А.Сергачоў, С.Дз.Філімонаў.

СПАРТЫЎНЫЯ ЗВАННІ, званні, якія сведчаць аб афіцыйным прызнанні спарт. заслуг у пэўнай спарт. кваліфікацыі. Даюцца часова або пажыццёва за дасягненні на міжнар., нац. і інш. афіц. спаборніцтвах, выкананне нарматываў і патрабаванняў, устаноўленых *спартыўнай класіфікацыяй*, за плённую пед., трэнерскую, судзейскую і інш. дзейнасць.

Існуюць міжнар. С.з. (зацвярджаюцца міжнар. спарт. федэрацыямі): суддзя міжнар. катэгорыі (па відах спорту); міжнар. гросмайстар і майстар (па шахматах і шашках, з 1949). У СССР існавалі ганаровыя С.з.: засл. майстар спорту (з 1934), засл. трэнер СССР (з 1956), ганаровы суддзя па спорце (з 1972); С.з.: майстар спорту СССР (з 1935), майстар спорту СССР міжнар. класа (з 1965), гросмайстар СССР (па шахматах з 1935, па шашках з 1961), суддзя ўсесаюзнай катэгорыі (з 1934). У 1950—60-я г. існавалі ганаровыя С.з. ў саюзных рэспубліках: майстра спорту па нац. відах спорту і засл. трэнера рэспублікі; да іх прымыкалі спарт. разрады: кандыдат у майстры, спартсмен 1—3-га разрадаў, а таксама юнацкія разрады. Да С.з. адносяць таксама званні чэмпіёна і рэкардсмена.

На Беларусі ўстаноўлены ганаровыя С.з.: засл. трэнер БССР (з 1959), засл. дзеяч фіз. культуры БССР (з 1967), з 1995 — *заслужаны трэнер Рэспублікі Беларусь* і *заслужаны работнік фізічнай культуры і спорту Рэспублікі Беларусь*.

СПАРТЫЎНЫЯ СПАБО́РНІЦТВЫ, комплекс мерапрыемстваў па арганізацыі і ажыццяўленні дзейнасці спарт. каманд ці асобных спартсменаў, якія маюць на мэце выяўленне мацнейшых сярод удзельнікаў; аснова *спорту*. Абумоўліваюць дасягненне вышэйшых спарт. вынікаў, удасканаленне спарт. майстэрства, прапагандуюць фіз. культуру і спорт. Дазваляюць супастаўляць фіз. і інтэлектуальныя здольнасці спартсменаў, іх узровень валодання тэхнікай і тактыкай пэўнага віду спорту, разнастайнымі тэхн. сродкамі, абсталяваннем і механізмамі; ацэньваць дзейнасць спарт. арг-цый, трэнераў, спартсменаў, суддзяў. Праводзяцца па стандартных афіц. правілах, пры забеспячэнні аднолькавых умоў для ўдзельнікаў, аб'ектыўным судзействе, тэхн. аснашчанасці, выкананні этычных норм (узаемапавага сапернікаў, суддзяў і балельшчыкаў, адмова ад выкарыстання забароненых біял. і мед. прэпаратаў і сродкаў).

Паводле маштабаў ахопу падзяляюцца на сусветныя (*Алімпійскія гульні, універсіяда*, чэмпіянаты і кубкі свету, шахматныя

алімпіяды і інш.); рэгіянальныя (кантынент. чэмпіянаты, кубкі, гульні); нацыянальныя (асобных краін); абласныя; гарадскія і г.д. Бываюць комплексныя (Алімп. гульні, *Параалімпійскія гульні, спартакіяды* і інш.) і спецыялізаваныя (па асобных відах спорту); у залежнасці ад задач і ўмоў выяўлення пераможцаў — асабістыя, камандныя і асабіста-камандныя; паводле характару правядзення — афіцыйныя (на званне чэмпіёна, уладальніка кубка і інш.), класіфікацыйныя (для вызначэння спарт. кваліфікацыі ўдзельнікаў) і неафіцыйныя, якія ўключаюць С.с. камерцыйныя, таварыскія і па запрашэнні (дазваляюць адхіленні ад афіц. правіл, могуць уключаць нестандартныя дысцыпліны, дыстанцыі і інш.; іх вынікі не ўлічваюцца міжнар. спарт. арг-цыямі, федэрацыямі). Існуюць 3 асн. сістэмы правядзення С.с.: кругавая (усе ўдзельнікі сустракаюцца паміж сабой адзін або некалькі разоў, за перамогу налічваюцца ачкі), кубкавая (з выбываннем тых, што прайгралі) і змешаная (аб'ядноўвае прынцыпы кругавой і кубкавай сістэм). Праводзяцца раздзельна для мужчын і жанчын (акрамя коннага спорту, шэрагу тэхн. відаў і інш.); у залежнасці ад узросту ўдзельнікаў (дзіцячыя, юніёрскія, маладзёжныя, дарослыя, ветэранскія); у некат. відах спорту (тэніс, тэніс настольны, фігурнае катанне) прадугледжаны спаборніцтвы змешаных пар. *Я.К.Кулінковіч.*

СПАРТЫЎНЫЯ СУ́ДНЫ, судны, што выкарыстоўваюцца для спаборніцтваў у вяслярным і ветразевым спорце. Форма, памеры і абсталяванне С.с., колькасць членаў экіпажа і інш. рэгламентуюцца правіламі спаборніцтваў. Да вяслярных С.с. адносяцца *акадэмічныя вёславыя судны, байдаркі, каноэ, шлюпкі, лодкі* для нар. веславання і інш. Спарт. ветразевыя судны — *яхты* розных класаў. Маторныя С.с. (напр., *скутэры*) аснашчаюць стацыянарнымі ці падвеснымі рухавікамі.

СПАРТЫЎНЫЯ ТАВАРЫ́СТВЫ, добраахвотныя спартыўныя таварыствы (ДСТ), масавыя арганізацыі, якія аб'ядноўвалі грамадзян для заняткаў фізкультурай і спортам.

Ствараліся паводле тэр. і вытворча-галіновай адзнак. Пярвічнымі арг-цыямі ДСТ былі калектывы фіз. культуры і спарт. клубы прадпрыемстваў, калгасаў, саўгасаў, навуч. устаноў. У СССР дзейнічалі 7 усесаюзных С.т.: «Буравеснік», «Воднік», «Дынама», «Зеніт», «Лакаматыў», «Спартак», «Працоўныя рэзервы»; 30 рэсп. ДСТ (15 з іх аб'ядноўвалі калектывы фіз. культуры прамысл. прадпрыемстваў і інш., 15 — сельскія спарт. калектывы). У інш. краінах аналагам С.т. з'яўляюцца аматарскія і прафес. спарт. клубы.

На Беларусі да 1917 існавалі аддзяленні ўсерас. «Т-ва садзейнічання фіз. развіццю вучнёўскай моладзі», С.т. «Санітас», «Сокал», «Унітас», яўр. нац. С.т. «Макабі» і інш. З 1930-х г. дзейнічалі рэсп. арг-цыі ўсесаюзных ДСТ: «Лакаматыў» (з 1936), «Працоўныя рэзервы» (з 1944), «*Дынама*», «*Спартак*», «Буравеснік» (з 1958), «Воднік» (з 1964); рэсп. т-вы «Ураджай» (сельскае, з 1956), «Чырвоны сцяг» (прафсаюзнае, з 1958). У 1985—93 пасля рэарганізацый С.т. раз'яднаны на асобныя фізкультурна-спарт. клубы і арг-цыі. *А.М.Петрыкаў.*

СПАРТЫЎНЫЯ ШКО́ЛЫ, спецыялізаваныя навучальна-выхаваўчыя ўстановы, у якіх рыхтуюць юных спартсменаў высокай кваліфікацыі па розных відах спорту.

С.ш. для дзяцей і моладзі бываюць інтэрнатнага тыпу (спалучаюць агульнаадук. і спарт. падрыхтоўку) і ў выглядзе секцый, груп і інш. пры *спартыўных клубах*. У СССР дзіцячыя С.ш. існавалі з 1934 (Масква, Ленінград, сталіцы саюзных рэспублік і інш.). На Беларусі існуюць з 1945 (Мінск, Брэст, Гомель); ёсць дзіцяча-юнацкія С.ш. і школы вышэйшага спарт. майстэрства (больш за 400 С.ш.; пач. 2002).

СПАРЫННЁВЫЯ, парадак сумчатых грыбоў, тое, што *клавіцыпітальныя*.



Да арт. **Спарыння**. Пашкоджаныя каласы: 1 — жыта; 2 — купкоўкі; 3 — ячменю; 4 — будова галоўкі стромы; 5 — праросты склероцый.

СПАРЫ́ННЯ, 1) род паразітычных грыбоў, тое, што *клавіцэпс*. 2) Хвароба збожжавых, якую выклікае сумчаты грыб клавіцэпс пурпуровы. Характарызуецца ўтварэннем у каласках раслін замест зярнявак буйных ражкоў (*склероцыяў* грыба) спачатку фіялетавага, потым чорнага колеру. Пашкоджвае больш за 170 культ. і дзікарослых злакаў, найчасцей жыта. У некат. гады масавае развіццё С. назіраецца на тарфяна-балотных глебах Палесся, на пасевах паблізу вадаёмаў і лясоў з павышанай вільготнасцю.



Спарышы.

Склероцыі грыба зімуюць у глебе ці ў збожжы, вясной прарастаюць і ўтвараюць да 30 мясістых пурпуровых стром на ножцы (да 5 см) з чырванаватымі галоўкамі. У стромах утвараюцца пладовыя цялы з сумкамі і сумкаспорамі, якія выклікаюць першаснае заражэнне раслін. На кветках сумкаспоры прарастаюць у міцэлій, які пранікае ў завязь, разрастаецца і ўтварае канідыяльнае споранашэнне. Грыб выдзяляе ліпкую саладкаватую вадкасць (*падзь*), якая прывабліве насякомых. Канідыі распаўсюджваюцца насякомымі і выклікаюць масавае заражэнне раслін. У перыяд выспявання зерня міцэлій становіцца цвёрдым, ператвараецца ў склероцыі.

СПАРЫШЫ́, у беларусаў ганчарны выраб — гліняная пасудзіна з 2 ці 3 гаршкоў (зрэдку і сальніцы) аднолькавых ці розных памераў, змацаваных ручкай (да гаршкоў рабіліся і накрыўкі). Інш. назвы парнікі, двайнічкі, блізняты. У С. насілі ежу на поле ў час сенакосу ці жніва.

СПАС, старажытнае свята земляробчага календара, прымеркаванае да часу выспявання садавіны, агародніны. Вядомы славянам і інш. еўрап. народам. Лічыўся мяжой паміж летнім і асеннім цыкламі работ: са С. пачыналі сяўбу азімых, капалі раннюю бульбу, падглядалі пчол. Падгляд пчол меў характар сталага звычаю. Паводле бел. нар. календара, са С. пачыналася ранняе бабіна лета («Прыйшоў спас — і лета ад нас»). На С. наладжвалі кірмашы, на якіх прадавалі садавіну, агародніну, мёд. С. папярэднічаў пост. У жніўні святкаваліся тры С.: першы (мядовы), другі (яблычны) і трэці (агароднінны). На Беларусі найб. святкаваўся яблычны С. (19 жн.), лічылася, што да гэтага часу нельга есці яблыкі. Царква прымеркавала да яго свята Праабражэння Хрыстова, надала нар. рытуалам рэліг. значэнне (асвячэнне пладоў, насення). Рэшткі стараж. свята выяўляліся ў імкненні ласавацца ў гэты дзень садавінай («Прыйшоў спас — на ўсё час»). *А.В.Цітавец.*

СПАС Уладзімір Уладзіміравіч (н. 10.2.1941, г. Гродна), бел. вучоны ў галіне анестэзіялогіі, рэаніматалогіі і інтэнсіўнай тэрапіі. Д-р мед. н. (1990), праф. (1992). Скончыў Гродзенскі мед. ін-т (1964), дзе і працуе з 1970 (з 1991 заг. кафедры). Навук. працы па пытаннях дыягностыкі і інтэнсіўнай тэрапіі сепсісу.

СПАСАКУКО́ЦКІ Сяргей Іванавіч (10.6.1870, г. Кастрама, Расія — 17.11.1943), расійскі вучоны ў галіне хірургіі, адзін з заснавальнікаў страўнікава-кішачнай хірургіі. Акад. АН СССР (1942) і АМН СССР (1934). Засл. дз. н. РСФСР (1934). Скончыў Маскоўскі ун-т (1893). З 1912 праф. Саратаўскага ун-та,

з 1926 — 2-га Маскоўскага мед. ін-та, адначасова гал. хірург бальніцы лячэбна-сан. ўпраўлення Крамля. Навук. працы па пытаннях касцявой пластыкі, хірургіі органаў грудной і брушной поласцей, пераліванне крыві, уралогіі, нейрахірургіі, асептыкі. Дзярж. прэмія СССР 1942.

Тв.: Труды. Т. 1—2. М., 1948.

Літ.: Спасокукоцкая М.Г. Жизнь и деятельность С.И.Спасокукоцкого, 1870—1943. М., 1960.

СПАСО́ВІЧ Уладзімір Данілавіч (16.1.1829, г. Рэчыца Гомельскай вобл. — 26.10.1906), юрыст, публіцыст, літаратуразнавец. Пісаў на рус. і польскай мовах. Скончыў Мінскую гімназію, Пецярбургскі ун-т (1849). У 1857—61 праф. права Пецярбургскага ун-та. Працаваў адвакатам у Пецярбургу і Варшаве. Аўтар прац па крымін. праве, гісторыі міжнар. права, польскім і еўрап. рамантызме, рус.-польскіх літ. сувязях. Заклікаў да рус.-польскага збліжэння і супрацоўніцтва. Навук. працы С. прасякнуты гуманізмам, павагай да асобы чалавека, да чужых думак і перакананняў.

Тв.: Соч. Т. 1—10. 2 изд. СПб., 1913; Pisma. T. 1—9. Peterburg, 1892—1908.

Літ.: Кони А.Ф. В.Д. Спасович // Собр. соч. М., 1968. Т. 5.

СПАСО́ЎСКІ-ГРОТ (Spasowski-Grot), Грот-Спасоўскі Аляксандр (1808?—1847?), польскі паэт-рамантык. У 1828—29 жыў у Магілёве. Друкаваўся ў час. «Dziennik Wileński» («Віленскі дзённік»). Выдаў у Вільні зб. «Паэзія» (т. 1—2, 1840). У прадмове да яго пісаў, што рамант. «мода» патрабуе «простанародных песенек», створаных на ўзор «уяўна літоўскіх (г.зн. беларускіх) дудароў і ўкраінскіх лірнікаў», заклікаў пісаць «сваім, народным стылем у прыватнасцях, а прама нацыянальным у цэлым». Большасць балад і вершаваных апавяданняў зборніка («Апошняе паляванне», «Святое возера», «Панцырны», «Скруха») мае падзагаловак «З беларускіх паданняў» і канкрэтна ўказанае месца, дзе іх расказалі аўтару (Магілёў, яго ваколіцы). Некат. яго творы (балада «Апошняе паляванне») антыпрыгонніцкай накіраванасці. Адначасова ідэалізаваў жыццё бел. сялян, іх адносіны з панам («Песня жнеек»). У зборніку адчуваецца ўплыў А.Міцкевіча, ёсць творы з укр., рус., літ. і лат. тэматыкай. *А.В.Мальдзіс.*

СПЕ́ВЫ, вакальнае мастацтва, мастацтва перадаваць сродкамі пеўчага *голасу* і выканальніцкага інтанавання ідэйна-вобразны змест муз. твора; адзін са стараж. відаў выканальніцтва. С. бываюць аднагалосыя (*сола*), ансамблевыя (*дуэт, трыо, квартэт*) і харавыя; са словамі і без іх (на галосных гуках — вакалізацыя), з інстр. акампанементам і без яго (*а капэла*). Асн. жанры С. у класічнай музыцы: С. оперныя, звязаныя з тэатр.-драм. дзеяннем, і камерныя — выкананне *рамансаў, песень* і інш. Адрозніваюць 4 асн. тыпы вакальных мелодый і, адпаведна, 4 стылі С.: пявучы (канты-ленныя плаўныя мелодыі шырокага дыхання), каларатурны (адметны тэхн. складанасцю, віртуознасцю выканання), дэкламацыйны (разнастайныя інтанацыі мовы, структура слоўнага тэксту), рэчытатыўны (гл. *Рэчытатыў*). Для праф. С. неабходны пеўчы голас (выразны, яркага тэмбру, шырокага дыяпазону), валоданне вак. тэхнікай (пастаноўка голасу і дыхання), выразная дыкцыя, агульная муз.-праф. адукацыя. Розныя нац. школы С. вылучаюцца стылем выканальніцтва, манерай гукавядзення і характарам пеўчага голасу.

Праф. вак. мастацтва існавала ўжо ў Стараж. Егіпце, Грэцыі, краінах Усходу, пераважна ў форме нар. і культавых С. З узнікненнем хрысціянства С. ўвайшлі ў царк. богаслужэнні, пры манастырах і цэрквах існавалі школы С. Першая еўрап. школа С. — італьян. (склалася ў пач. 17 ст., вызначаласа дасканалай тэхнікай *бельканта* і выдатнымі галасамі). У Расіі пеўчая культура вядома з 10 ст. Асн. від стараж. царк. С. — *знаменны спеў* — быў пашыраны ў Расіі, Украіне і Беларусі. У 17 ст. зацвердзіліся *партэсныя спевы*. У 18 ст. росту прафесіяналізму рус. кампазітараў і спевакоў садзейнічала італьян. опера. Асновы рус. нац. школы С. зацвердзіў М.Глінка, вучнямі якога былі спевакі С.Гулак-Арцямоўскі, В.Пятроў, Г.Вараб'ёва-Пятрова, Д.Лявонава. Далейшае развіццё рус. вак. мастацтва звязана з дзейнасцю спевакоў І.Рупіна, А.Варламава (аўтар «Поўнай школы спеваў», 1840), кампазітараў А.Даргамыжскага, М.Балакірава, М.Мусаргскага, П.Чайкоўскага, М.Рымскага-Корсакава і інш. Рус. вак. школе характэрны высокі прафесіяналізм, шчырасць і прастата выканання, уменне арганічна спалучаць вак. майстэрства з тонкай псіхал. ігрой драм. акцёра (Ф.Шаляпін, І.Ярошоў, А.Нежданава, Л.Собінаў, Р.Пірагоў і інш.). У сав. час спевакі развівалі лепшыя традыцыі рус. класічнай школы (А.Абразцова, Н.Абухава, І.Архіпава, У.Атлантаў, В.Барсава, М.Біешу, Б.Гмыра, Н.Дарліяк, З.Далуханава, С.Лемешаў, І.Казлоўскі, В.Нарэйка, У.Несцярэнка, Г.Нэлеп, М.Рэйзен, Т.Сіняўская, Б.Штокалаў і інш.).

На Беларусі нац. рысы выканальніцтва замацаваны ва ўсіх відах і жанрах нар.-песеннай культуры. Характар бел. напеваў, што ўвасобілі агульныя традыцыі, абумоўлены асаблівасцямі мовы, тэмпераментам, духоўным складам, характарам народа, што спрыяла развіццю спецыфічных і разнастайных прыёмаў выканання і гукаўтварэння — *галасны спеў*, С. з *падводкай*, прыёмы *гетэрафоніі* і бурданіравання (гл. *Бурдон*). У 16—18 ст. на Беларусі развівалася свецкая кантавая культура, асн. жанры якой — *канты* і *псальмы*. Уклад у станаўленне пеўчага мастацтва зрабілі бел. брацтвы, пры якіх існавалі школы хар. С. Развіццё прафес. С. у 18 ст. звязана з дзейнасцю прыватных т-раў і капэл. У 20 ст. на Беларусі сфарміравалася нац. школа С., якая вылучыла шэраг вядомых майстроў, у іх ліку нар. арт. СССР Л.Александроўская, М.Ворвулеў, С.Данілюк, Т.Ніжнікава, А.Саўчанка, нар. арт. Беларусі І.Балоцін, З.Бабій, Л.Бражнік, В.Валчанецкая, Н.Гайда, Л.Галушкіна, А.Генералаў, В.Глушакоў, М.Дзянісаў, С.Друкер, Л.Златава, М.Зюванаў, Р.Млодак, Я.Пятроў, І.Сайкоў, І.Сарокін, М.Сярдобаў, В.Чарнабаеў, І.Шыкунова, Т.Шымко, засл. арт. Беларусі Т.Глаголева, М.Грыгорчык, В.Кавальчук, А.Мельнікаў, А.Пятроў, В.Скорабагатаў і інш. Вял. роля ў развіцці нац. вак. мастацтва належыць *Беларускай акадэміі музыкі, Нацыянальнаму акадэмічнаму тэатру оперы Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўнай акадэмічнай харавой капэле Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўнаму акадэмічнаму народнаму хору Рэспублікі Беларусь, Хору акадэмічнаму беларускага тэлебачання і радыё*. Дзярж. сістэма муз. адукацыі і выхавання створана ў 1930-х г.: спевакоў рыхтуюць Бел. акадэмія музыкі (кафедра спеваў і оперная студыя), муз. вучылішчы, выкладчыкаў спеваў агульнаадук. школ — Бел. пед. ун-т (муз.-пед. ф-т). Гл. таксама *Вакальная музыка*.

Літ.: Иванов А.П. Об искусстве пения. М., 1963; Морозов В.П. Вокальный слух и голос. М.; Л., 1965; Ягож. Тайны вокальной речи. Л., 1967; Дмитриев Л.Б. Основы вокальной методики. М., 1968; Костюковец Л.Ф. Кантовая культура в Белоруссии. Мн., 1975; Можейко З.Я. Календарно-песенная культура Белоруссии. Мн., 1985; Мухарынская Л.С., Якіменка Т.С. Беларуская народная музычная творчасць. Мн., 1993; Пікарда Г. дэ. Царкоўная музыка на Беларусі, 989—1995. Мн., 1995; Музычны тэатр Беларусі. [Т. 1—4]. Мн., 1990—97; Дадзіёмава В.У. Нарысы гісторыі музычнай культуры Беларусі. Мн., 2000.

Э.А.Алейнікава.

«СПЕЙС ШАТЛ» (англ. Space Shuttle касмічны чаўнок), пілатуемы трансп. касм. карабель ЗША шматразовага выкарыстання; праграма яго распрацоўкі і запуску. Прызначаны для вываду *касмічных апаратаў* на геацэнтрычныя арбіты і аўтам. станцый на траекторыі палёту да планет, астэроідаў і камет, правядзення тэхнал. і навук. эксперыментаў і даследаванняў. Выкарыстоўваўся для дастаўкі і вяртання на Зямлю экспедыцый наведвання арбітальнай станцыі «*Мір*»; выконвае трансп. аперацыі па праграме стварэння Міжнар. касм. станцыі.

Стартавая маса ~2 тыс. т, даўж. 56 м. Макс. карысны груз 29,5 т пры вывадзе на арбіту вышынёй 185 км. Макс. працягласць арбітальнага палёту да 30 сут (у складзе арбіталь-



«Спейс шатл»: 1 — знешні (падвесны) паліўны бак; 2 — памяшканне для экіпажа на арбітальнай ступені; 3 — 2-я (арбітальная) ступень; 4 — адсек карыснага грузу; 5 — цвердапаліўныя блокі 1-й ступені; 6 — асноўны вадкасны ракетны рухавік арбітальнай ступені; 7, 8 — вадародны і кіслародны адсекі бака 1.

нага комплексу). Экіпаж 2—7 чал. Выкананы па 2-ступеньчатай схеме з паралельным размяшчэннем ступеней. Пры старце (вертыкальным) уключаюцца рухавікі абедзвюх ступеней. 1-я ступень — 2 цвёрдапаліўныя блокі (паскаральнікі), якія пасля аддзялення, парашутнай пасадкі ў акіян і аднаўлення выкарыстоўваюцца паўторна (да 20 разоў). 2-я ступень (арбітальная) — крылатая пілатуемая; маса больш за 110 т, даўж. 37,3 м, крыло з падвойнай стрэлападобнасцю (размах 23,8 м) забяспечвае неабходныя аэрадынамічныя характарыстыкі; мае знешні скідвальны бак з вадкім палівам (адзіны аднаразовы элемент



Схема палёту «Спейс шатл»: 1 — пуск; 2 — аддзяленне цвердапаліўных паскаральнікаў; 3 — парашутная пасадка паскаральнікаў у акіян; 4 — аддзяленне скідвальнага паліўнага бака; 5 — арбітальны палёт; 6 — тармажэнне арбітальнай ступені і ўваход у атмасферу; 7 — пасадка.

«С.ш.»); пасля сыходжання з арбіты выконвае спуск у «самалётным» рэжыме. Першы старт «С.ш.» 12.4.1981. Здзейснена 107 палётаў (2002), у т.л. арбітальных ступеней: «Атлантыс» — 24, «Дыскаверы» — 30, «Індэвар» — 16, «Калумбія» — 26, «Чэленджэр» — 10 (11-ы пацярпеў катастрофу ў час старту 28.1.1986).

У.С.Ларыёнаў.

СПЕКТА́КЛЬ (франц. spectacle ад лац. spectaculum відовішча), твор сцэнічнага мастацтва, які ствараецца тэатр. калектывам, у сучасным т-ры ўзначальваецца рэжысёрам-пастаноўшчыкам. У С. аб'ядноўваюцца мастацтва драматурга, рэжысёра, акцёраў, мастака, кампазітара і інш. Ідэйная і творчая задума С. вызначаюцца зместам п'есы, асаблівасцямі трупы, духоўнымі і эстэт. запатрабаваннямі гледача. Гл. таксама *Акцёрскае мастацтва, Рэжысёрскае мастацтва, Сцэнаграфія, Тэатр.*

СПЕКТР (ад лац. spectrum вобраз, відарыс, прывід) у ф і з і ц ы, сукупнасць значэнняў, якія можа прымаць пэўная фіз. велічыня (энергія, імпульс, скорасць і інш.). Бываюць неперарыўныя (гл. *Суцэльны спектр*) і дыскрэтныя (гл. *Лінейчасты спектр, Паласатыя спектры*). Найб. часта панятце С. выкарыстоўваецца ў дачыненні да вагальных працэсаў (гл. *Спектр ваганняў, Спектры аптычныя*).

СПЕКТР ВАГА́ННЯЎ, сукупнасць *гарманічных ваганняў* (гармонік), на якія раскладаецца дадзены вагальны рух. У залежнасці ад прыроды вагальных працэсаў адрозніваюць спектры аптычныя, рэнтгенаўскія, мех. (напр., спектр гуку), эл.-магн. сігналаў. С.в. вывучаюцца метадамі *спектраметрыі*.

Матэматычна вагальны рух прадстаўляецца функцыяй у выглядзе *Фур'е шэрагу* (для перыяд. ваганняў) ці *Фур'е інтэграла* (для неперыяд. ваганняў). Чым больш зыходнае ваганне адрозніваецца ад гарманічнага, тым на большую сукупнасць гармонік (*абертонаў*) яно раскладаецца. Чысты тон — гук з перыядычнай формай хвалі — вылучаецца, напр., *камертонам*. Гукі, вылучаныя муз. інструментамі, разам з асн. тонам маюць і абертоны, якія надаюць асаблівую «афарбоўку» (тэмбр) гуку. Спектры радыёхваль радыё- і тэлепраграм маюць выгляд палос, цэнтр якіх вызначаецца *нясучай частатой*, а бакавыя частоты — перададзенай інфармацыяй. *П.А.Апанасевіч.*

СПЕКТРА́ЛЬНАЯ АДЧУВА́ЛЬНАСЦЬ п р ы ё м н і к а в ы п р а м я н е н н я, адносіны велічыні, што характарызуе ўзровень рэакцыі прыёмніка (выхаднога сігналу), да патоку энергіі монахраматычнага выпрамянення, які выклікаў гэтую рэакцыю. Адрозніваюць а б с а л ю т н у ю С.а. (выражаецца, напр., у амперах на ват, калі рэакцыя прыёмніка выражаецца ў амперах) і а д н о с н у ю С.а. — адносіны С.а. пры дадзенай даўжыні хвалі выпрамянення да максімальнай С.а. ці да С.а. пры пэўнай фіксаванай (эталоннай) даўжыні хвалі. С.а. вока (спектральная светлавая эфектыўнасць выпрамянення) — адносіны *светлавога патоку* монахраматычнага выпрамянення да поўнага патоку выпрамянення, успрынятага вокам чалавека; найб. значэнне мае для даўжыні хвалі 555 нм. Спосабы вызначэння абсалютнай і адноснай С.а. вока пакладзены ў аснову пабудовы сістэмы светлавых велічынь. Гл. таксама *Прыёмнікі аптычнага выпрамянення, Сенсібілізацыя, Сенсітаметрыя, Фотаметрыя.*

СПЕКТРА́ЛЬНАЯ КЛАСІФІКА́ЦЫЯ ЗО́РАК, падзел зорак на класы паводле асаблівасцей іх спектраў.

Аснова сучаснай С.к.з. — Гарвардская класіфікацыя і яе вынік — каталог Г. Дрэпера, які змяшчае спектральныя характарыстыкі 225 320 зорак Паўн. і Паўд. паўшар'яў неба (амаль усе зоркі да 9 зорнай велічыні). Спектры большасці зорак размяшчаюцца ў выглядзе паслядоўнасці, уздоўж якой інтэнсіўнасць ліній адных хім. элементаў паступова слабее, а іншых — узмацняецца. Падобныя паміж сабой спектры аб'ядноўваюць у спектральныя класы. Абазначаюць іх лац. літарамі ў паслядоўнасці



якая адпавядае змене колеру (зоркі класаў O, B — блакітныя, A, F — белыя, G — жоўтыя, у т.л. Сонца, K — аранжавыя, M — чырвоныя), паказчыка колеру і ўбыванню эфектыўнай т-ры (ад 30 тыс. да 3 тыс. K); адгалінаванні алюстроўваюць адрозненні хім. саставу. Кожны клас (акрамя O) падзяляецца паводле тонкіх адрозненняў паміж спектрамі ўнутры класа на 10 падкласаў, якія абазначаюцца лічбамі ад 0 да 9, што ставяцца пасля літары. Клас O падзяляецца на падкласы ад O4 да O9,5. Іншыя асаблівасці, нетыповыя для дадзенага класа, абазначаюцца малымі лац. літарамі; напр., па інтэнсіўнасці некаторых ліній паглынання вызначаюць *свяцільнасць зоркі* (*гігант* або *карлік*): у гіганта перад спектральным класам ставіцца індэкс g, у карлікаў — d. С.к. з. дае магчымасць вызначаць класы зорак параўнаннем іх спектраў са спектрамі зорак, для якіх спец. даследаваннямі надзейна ўстаноўлены т-ра фотасфер і абс. візуальныя велічыні. Гл. таксама *Герцшпрунга—Рэсела дыяграма.*

А.А.Шымбалёў.

СПЕКТРА́ЛЬНАЯ СВЕТЛАВА́Я ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ в ы п р а м я н е н н я, успрынятага вокам чалавека, гл. ў арт. *Спектральная адчувальнасць.*

СПЕКТРА́ЛЬНАЯ ШЧЫ́ЛЬНАСЦЬ, ліміт адносін светлавой велічыні (энергетычнай яркасці, светлавога патоку і інш.), якая адпавядае вузкаму ўчастку *спектра аптычнага*, да шырыні гэтага ўчастка. Графік залежнасці С.ш. ад даўжыні хвалі (частаты, хвалевага ліку ці інш.) характарызуе размеркаванне адпаведнай фіз. велічыні па спектры.

СПЕКТРА́ЛЬНЫ АНА́ЛІЗ ф і з і ч н ы, метады вызначэння якаснага і колькаснага саставу і будовы рэчываў па *спектрах аптычных* выпрамянення, паглынання, рассеяння ці адбіцця эл.-магн. выпрамянення. Паводле аб'екта даследавання адрозніваюць С.а. малекулярны, атамны і ядз. (гл. *Ядзерная спектраскапія*); паводле спосабу атрымання спектраў — эмісійны, люмінесцэнтны, абсарбцыйны, С.а. адбіцця, С.а. камбінацыйнага рассеяння і інш. Магчымы таксама С.а. па няпругкім рассеянні нейтронаў, энергетычным размеркаванні фотаэлектронаў. Праводзяць С.а. па спектрах *ядзернага магнітнага рэзанансу* і *электроннага парамагнітнага рэзанансу* (мікрахвалевы дыяпазон), вярчальных і вагальных (субміліметровы і інфрачырв. дыяпазоны), электронных (блізкі інфрачырв., ультрафіялетавы, рэнтгенаўскі дыяпазоны) і ядз. (гама-дыяпазон) з дапамогаю адпаведных *спектральных прылад*. Пры якасным С.а. вызначаюць даўжыні хваль спектральных ліній ці палос і іх паходжанне, пры колькасным — дадаткова вымяраюць інтэнсіўнасці ліній ці палос.

Для С.а. характэрны універсальнасць, высокая выбіральнасць, хуткасць і дакументальнасць; дазваляе аналізаваць практычна любыя рэчывы ў цвёрдым, вадкім ці газападобным станах. С.а. з выкарыстаннем аптычных аналізатараў (спрошчаныя спектральныя прыла-

ды) прыдатны для правядзення экспрэснага аналізу ў цэхах прадпрыемстваў і на патоку з адваротным рэгуляваннем. Атамны С.а. выкарыстоўваюць у машынабудаванні, металургіі, геалогіі, хіміі, біялогіі, сельскай гаспадарцы для аналізу элементнага і ізатопнага саставу сплаваў, мінералаў, руд, глебы і інш.; малекулярны С.а. — для ідэнтыфікацыі рэчываў, вызначэння чысціні прэпаратаў і асаблівасцей іх структуры, складу сумесей, а таксама наяўнасці пэўных груп і радыкалаў, хім. будовы, між- і ўнутрымалекулярных узаемадзеянняў, прасторавай арыентацыі структурных элементаў малекулы.

На Беларусі даследаванні па распрацоўцы і выкарыстанні метадаў малекулярнага і атамнага С.а. праводзяцца ў Ін-це фізікі, Ін-це малекулярнай і атамнай фізікі Нац. АН Беларусі, БДУ і інш.

Літ.: Ельяшевич М.А. Атомная и молекулярная спектроскопия. 2 изд. М., 2001; Колебания молекул. 2 изд. М., 1972; Жбанков Р.Г. Инфракрасные спектры и структура углеводов. Мн., 1972; Кузяков Ю.Я., Семененко К.А., Зоров Н.Б. Методы спектрального анализа. М., 1990.

П.А.Апанасевіч, Р.Г.Жбанкоў.

СПЕКТРА́ЛЬНЫЯ ЛІ́НІІ, вузкія ўчасткі ў *спектрах* выпрамянення, паглынання і рассеяння эл.-магн. хваль. Характарызуюцца пэўнай частатой (даўжынёй хвалі), шырынёй (гл. *Шырыня спектральных ліній*) і інтэнсіўнасцю выпрамянення. Кожная С.л. адпавядае пэўнаму квантаваму пераходу паміж *узроўнямі энергіі* атамных ядраў, атамаў, іонаў, малекул рэчыва, і кожнай такой часціцы рэчыва адпавядае пэўны набор С.л., што пакладзена ў аснову *спектральнага аналізу*.

СПЕКТРА́ЛЬНЫЯ ПРЫЛА́ДЫ, прылады і прыстасаванні, якія выкарыстоўваюцца для раскладання эл.-магн. выпрамяненняў (ваганняў) у *спектр*, яго рэгістрацыі і даследавання, а таксама для правядзення *спектральнага аналізу*.

С.п. бываюць: залежна ад дыспергавальнага элемента— прызмавыя і з дыфракцыйнай рашоткай; ад віду аптычнай сістэмы — лінзавыя і люстраныя; ад рабочай часткі спектра — для ультрафіялетавага выпрамянення, бачнага (святла) і інфрачырвонага выпрамянення; ад спосабу рэгістрацыі спектра — з візуальнай (*спектраскопы*), фатаграфічнай (*спектрографы*) і фотаэл. (*спектрометры*, спектрафатометры) рэгістрацыяй. С.п. ў *радыёспектраскапіі* (радыёспектраскопы) працуюць з радыёвыпрамяненнем у галіне міліметровых і сантыметровых хваль. С.п. з выхаднай шчылінай, якая вылучае вузкі спектральны інтэрвал, наз. *монахраматарамі*. Аптычныя С.п. характарызуюцца: вуглавой і лінейнай дысперсіяй (вызначаюць памеры спектра); раздзяляльнай здольнасцю (вызначае найменшую адлегласць паміж 2 спектральнымі лініямі, якія ўспрымаюцца раздзельна), святласілай (характарызуе долю светлавой энергіі, якая даходзіць да прыёмніка выпрамянення). Найб. раздзяляльная здольнасць у інтэрферэнцыйных С.п. (эталон Фабры-Перо, пласцінка Люмера-Герке, эталон Майкельсана і інш.); з-за невялікай вобласці дысперсіі яны выкарыстоўваюцца звычайна ў спалучэнні з прызмавымі і дыфракцыйнымі монахраматарамі. С.п. выкарыстоўваюцца для вывучэння будовы рэчыва, вызначэння спектральных характарыстык выпраменьвальнікаў і аб'ектаў, якія ўзаемадзейнічаюць з выпрамяненнем, даследавання спектраў свячэння зорак, дыстанцыйнай дыягностыкі аб'ектаў навакольнага асяроддзя і інш.



Блок-схема аднаканальнай **спектральнай прылады**: К — крыніца выпрамянення; М — мадулятар аптычны; Ф — фільтр сканіруючы (монахраматар); П — прыёмнік выпрамянення фотаэлектрычны; У — узмацняльнік сігналаў; Р — рэгістратар; БК — блок кіравання.

Літ.: Тарасов К.И. Спектральные приборы. 2 изд. Л., 1977; Зайдель А.Н., Островская Г.В., Островский Ю.И. Техника и практика спектроскопии. 2 изд. М., 1976; Нагибина И.М., Михайловский Ю.К. Фотографические и фотоэлектрические спектральные приборы и техника эмиссионной спектроскопии. Л., 1981; Скоков И.В. Оптические спектральные приборы. М., 1984.

П.А.Апанасевіч.

СПЕКТРА́ЛЬНЫЯ СЕ́РЫІ, сукупнасці *спектральных ліній* у *атамных спектрах*, што падпарадкоўваюцца пэўным заканамернасцям. Лініі дадзенай С.с. ў спектрах выпрамянення ўзнікаюць пры квантавых пераходах атама з розных *узроўняў энергіі* на адзін і той жа ніжні ўзровень; у спектрах паглынання — з ніжняга ўзроўню на больш высокія ўзроўні энергіі. Найб. выразна С.с. назіраюцца ў спектрах вадароду, вадародападобных атамаў, гелію і шчолачных металаў.

СПЕКТРАМЕ́ТРЫЯ (ад *спектр* + *...метрыя*), раздзел *спектраскапіі*, звязаны з вымярэннем залежнасці інтэнсіўнасці светлавых патокаў ад даўжыні хвалі святла. Для вывучэння гэтай залежнасці ў С. выкарыстоўваюць метад параўнання інтэнсіўнасці светлавога патоку да яго ўзаемадзеяння з доследным рэчывам і пасля ўзаемадзеяння. Гэтыя вымярэнні выконваюцца з дапамогай *спектрометраў* (*монахраматараў*) і інш. *спектральных прылад*.

СПЕКТРАПАЛЯРЫМЕ́ТРЫЯ (ад *спектр* + *палярыметрыя*), метад вымярэння дысперсіі вярчэння плоскасці палярызацыі і кругавога дыхраізму святла (залежнасці каэфіцыента паглынання ад віду кругавой палярызацыі) пры яго праходжанні праз аптычна актыўнае рэчыва (гл. *Аптычная актыўнасць*). Для вымярэнняў выкарыстоўваюцца спектрапалярыметры і дыхрографы, якія маюць аўтам. фотаэл. рэгістравальныя прылады і адрозніваюцца ад *палярыметраў* тым, што крыніца святла ў іх спалучана з *монахраматарам*. Дыхрографы таксама маюць прылады для вымярэння дыхраічнага паглынання ці прылады для пераўтварэння плоска палярызаванага святла ў эліптычна палярызаванае (гл. *Палярызацыя святла*).

СПЕКТРАСКАПІ́Я (ад *спектр* + *...скапія*), раздзел фізікі, які вывучае сувязь *спектраў* вылучэння, паглынання, рассеяння і адбіцця эл.-магн. *выпрамянення* са структурай і станам рэчыва, а таксама часціц, якія ўваходзяць у яго састаў. Служыць асновай развіцця і ўдасканалення метадаў *спектральнага аналізу*. Выкарыстоўваецца ў навук. даследаваннях у фізіцы, хіміі, біялогіі, астрафізіцы і інш. Даследаванні вядуцца з дапамогай *спектральных прылад*.

Пачатак С. — ад назіранняў спектра сонечнага выпрамянення І.*Ньютанам* (1666). У пач. 19 ст. адкрыты і даследаваны лініі паглынання ў сонечным спектры (фраўнгоферавы лініі), устаноўлена ўзаемасувязь паміж спектрамі вылучэння і паглынання і праведзена распрацоўка метадаў спектральнага аналізу (Г.Р.*Кірхгоф* і Р.*Бунзен*; 1859). Як самастойны раздзел навукі сфарміравалася ў пач. 20 ст. пасля стварэння квантавай механікі і квантавай тэорыі будовы атамаў і малекул, на якіх грунтуецца тэорыя С. У залежнасці ад аб'ектаў даследаванняў адрозніваюць атамную, малекулярную, ядзерную С., а таксама С. газаў, вадкасцей, крышталёў, мікра- і нанаструктур і інш. Паводле дыяпазонаў даўжынь эл.-магн. хваль (ці частот) С. падзяляюць на *радыёспектраскапію* (мікрахвалевую), аптычную С. (вывучае *спектры аптычныя*; уключае *інфрачырвоную спектраскапію*, С. бачнага выпрамянення і *ультрафіялетавую спектраскапію*); *рэнтгенаўскую спектраскапію* і *гама-спектраскапію*. Выкарыстанне *лазераў* і камп'ютэрнай тэхнікі дазволіла значна павялічыць частотную і часавую раздзяляльную здольнасць метадаў С., прывяло да ўзнікнення *лазернай спектраскапіі*, *нелінейнай спектраскапіі* і кінетычнай С. высокага раздзялення.

На Беларусі даследаванні па праблемах С. вядуцца ў Ін-тах фізікі, малекулярнай і атамнай фізікі Нац. АН, БДУ. Выдаецца часопіс «Журнал прикладной спектроскопии».

Літ.: Степанов Б.И. Люминесценция сложных молекул. Мн., 1955; Ельяшевич М.А. Атомная и молекулярная спектроскопия. 2 изд. М., 2001; Радиоспектроскопия. М., 1973; Немошкаленко В.В. Рентгеновская эмиссионная спектроскопия металлов и сплавов. Киев, 1972; Жбанков Р.Г. Инфракрасные спектры и структура углеводов. Мн., 1972; Грибковский В.П. Теория поглощения и испускания света в полупроводниках. Мн., 1975; Ахманов С.А., Коротеев Н.И. Методы нелинейной оптики в спектроскопии рассеяния света. М., 1981.

П.А.Апанасевіч.

СПЕКТРАСКО́П (ад *спектр* + *...скоп*), найпрасцейшая са *спектральных прылад* для візуальнага назірання спектраў выпрамянення. Звычайна робіцца па схеме прызмавага *спектрографа*, у факальнай плоскасці якога змяшчаецца матавае шкло. З дапамогай флюарэсцэнтнага акуляра візуальна назіраюць ультрафіялетавы спектр, з дапамогай *электроннаоптычнага пераўтваральніка* — блізкую інфрачырвоную вобласць спектра. Выкарыстоўваецца для якаснага спектральнага аналізу рэчываў у хіміі, металургіі і г.д.

СПЕКТРАФОТАМЕТРЫ́ЧНЫ АНА́ЛІЗ, гл. *Фотаметрычны аналіз*.

СПЕКТРАФОТАМЕ́ТРЫЯ, галіна *вымяральнай тэхнікі*, якая аб'ядноўвае *спектраметрыю, фотаметрыю* і *метралогію* і распрацоўвае сістэмы метадаў і прылад для колькасных вымярэнняў спектральных каэфіцыентаў паглынання, адбіцця, вылучэння, спектральнай яркасці як характарыстык асяроддзяў, пакрыццяў, паверхняў, выпрамяняльнікаў. Гл. таксама *Спектральныя прылады.*

СПЕКТРО́ГРАФ (ад *спектр* + *...граф*), аптычная *спектральная прылада*, прыёмнік якой (фатаграфічны матэрыял, шматэлементны фотапрыёмнік і інш.) рэгіструе ўвесь *спектр аптычны.* Апошні разгортваецца з дапамогай прызмаў або дыфракцыйнай рашоткі ў факальнай плоскасці прылады. Выкарыстоўваецца пераважна для прамысл. і навук. даследаванняў спектраў рэчываў, а таксама ў астр. даследаваннях (разам з *тэлескопам*) фіз. уласцівасцей і руху нябесных аб'ектаў.

СПЕКТРО́МЕТР (ад *спектр* + *...метр*), прылада для вымярэння функцыі размеркавання некаторай фіз. велічыні па зададзеным параметры. Функцыю размеркавання электронаў (і пазітронаў) па энергіях вымяраюць *бэта-спектрометрамі*, атамаў і малекул па масах — *мас-спектрометрамі*, гама-квантаў па энергіях — *гама-спектрометрамі*, энергію светлавых патокаў па даўжынях хваль (аптычным спектры) — аптычнымі С.

Да аптычных С. адносяць прылады для вылучэння вузкіх участкаў спектра аптычнага выпрамянення (*монахраматары*) і фотаэл. прыёмнікі выпрамянення. Класіфікацыя аптычных С. робіцца па колькасці каналаў і фіз. метадах раздзялення выпрамянення па даўжынях хваль (напр., Фур'е-С.). Аптычная С. звычайна наз. проста С. і ў гэтым сэнсе азначаюць аптычныя *спектральныя прылады* для вымярэння аптычных спектраў з дапамогай фотаэл. прыёмнікаў выпрамянення.

Літ.: Альфа-, бета- и гамма-спектроскопия: Пер. с англ. Вып. 1. М., 1969; Зайдель А.Н., Островская Г.В., Островский Ю.И. Техника и практика спектроскопии. 2 изд. М., 1976; Тарасов К.И. Спектральные приборы. 2 изд. Л., 1977; Якушенков Ю.Г. Теория и расчет оптико-электронных приборов. 3 изд. М., 1989.

П.Я.Місакоў.

«СПЕКТР — СВЯЦІ́ЛЬНАСЦЬ» ДЫЯГРА́МА, тое, што *Герцшпрунга—Рэсела дыяграма.*

СПЕ́КТРЫ АПТЫ́ЧНЫЯ, спектры выпрамянення (эмісіі), паглынання (адсорбцыі), рассеяння і адбіцця эл.-магн. выпрамянення ў інфрачырвоным, бачным і ультрафіялетавым дыяпазонах *шкалы электрамагнітных хваль.* Рэгіструюцца з дапамогай фатагр. метадаў, лічыльнікаў фатонаў (для ультрафіялетавай вобласці), тэрмаэлементаў і балометраў (для інфрачырвонай вобласці) і інш. С.а. бачнага святла называюцца візуальна.

Узнікаюць пры квантавых пераходах паміж *узроўнямі энергіі* атамаў, малекул, а таксама вадкіх і цвёрдых цел. Пры адсутнасці тэрмадынамічнай раўнавагі для атамаў характэрны *лінейчасты спектр* (гл. *Атамныя спектры*); для малекул — *паласатыя спектры*, абумоўленыя пераходамі паміж электроннымі, вагальнымі і вярчальнымі ўзроўнямі энергіі (гл. *Малекулярныя спектры*). С.а. выкарыстоўваюцца для вывучэння характарыстык крыніц святла, структуры і стану рэчыва, а таксама працэсаў, якія працякаюць у ім. Гл. таксама *Спектраскапія, Спектральны аналіз.*

П.А.Апанасевіч.

СПЕ́КТРЫ КРЫШТАЛЁЎ АПТЫ́ЧНЫЯ, спектры паглынання, адбіцця і рассеяння святла, а таксама люмінесцэнцыі і фотаправаднасці, што ўзнікаюць пры ўзаемадзеянні эл.-магн. хваль аптычнага дыяпазону з крышталямі. Абумоўлены квантавымі пераходамі, якія прыводзяць да змены энергет. стану электронаў і/ці энергіі вагальных станаў атамаў крышт. структуры.

Узроўні энергіі крышталя групуюцца ў дазволеныя энергет. зоны (гл. *Зонная тэорыя*). Паглынанне і вылучэнне святла (*фатонаў*) пры міжзонных пераходах электронаў можа адбывацца без узбуджэння ваганняў крышт. рашоткі (*фанонаў*) ці з удзелам фанонаў. Пры міжзонным паглынанні святла электрон з валентнай зоны пераходзіць праз забароненую энергет. зону (шчыліну) у зону праводнасці, і ў валентнай зоне ўтвараецца электронная вакансія (*дзірка*). Пры рэкамбінацыі свабодных ці звязаных у *экситон* электрона і дзіркі ўзнікае *люмінесцэнцыя.* Існуюць С.к.а., абумоўленыя як уласнымі дэфектамі крышт. рашоткі (вакансіямі, міжвузельнымі атамамі, дыслакацыямі), так і дамешкавымі атамамі. Сіметрыя крышт. рашоткі і яе дэфектаў вызначае *анізатрапію* С.к.а. Афарбоўванне (колернасць) крышталёў абумоўлена непаглынутай імі часткай белага святла. Існуюць штучныя і прыродныя крышт. структуры, памер якіх у адным, двух ці трох вымярэннях супараўнальны з дэбройлеўскай даўжынёй хвалі (гл. *Хвалі дэ Бройля*) электрона ў зоне праводнасці і/ці дзіркі ў валентнай зоне, а таксама з адлегласцю паміж імі пры ўтварэнні экситона; аптычныя спектры такіх структур моцна залежаць ад іх памераў.

Літ.: Васильев А.Н., Михайлин В.В. Введение в спектроскопию твердого тела. М., 1987; Gaponenko S.V. Optical properties of semiconductor nanocrystals. Cambridge, 1998.

М.А.Паклонскі.

СПЕКУЛЯ́ЦЫЯ (ад лац. speculatio высочванне, назіранне), проціпраўныя дзеянні супраць парадку ажыццяўлення эканам. дзейнасці, якія выяўляюцца ў скупцы на прадпрыемствах або ў арг-цыях дзярж. гандлю і спажывецкай кааперацыі тавараў, што прызначаюцца для рознічнага продажу насельніцтву, і перапродажу такіх тавараў з мэтай нажывы. Праследуецца ў адм. і крымін. парадку. Паводле крымін. заканадаўства Рэспублікі Беларусь С., учыненая на працягу аднаго года пасля прыцягнення асобы да адм. адказнасці, разглядаецца як злачынства, і вінаваты ў ім можа быць асуджаны да штрафу або да папраўчых работ, абмежавання свабоды на тэрмін ад 2 да 4 гадоў або да пазбаўлення волі на тэрмін да 2 гадоў. Тыя ж дзеянні, учыненыя групай асоб або па папярэдняй дамоўленасці, або работнікам гандлю ці спалучаныя з атрыманнем нажывы ў буйным памеры, караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін да 5 гадоў.

Э.І.Кузьмянкова.

СПЕ́ЛАСЦЬ ГЛЕ́БЫ, стан глебы, які характарызуе яе гатоўнасць да апрацоўкі (фіз. спеласць) ці да пасеву і пасадкі (біял. спеласць). Фізічная С.г. настае пры дасягненні аптым. ўвільгатнення (у час мех. апрацоўкі яна распадаецца на часцінкі 1—10 мм), вызначаецца візуальна. Глеба добра крышыцца, лёгка апрацоўваецца, у ёй ствараюцца аптым. суадносіны паміж цвёрдай часткай, вадой і паветрам. Біялагічная спеласць настае ў добра апрацаванай, увільготненай і прагрэтай глебе; у ёй інтэнсіўна праходзяць мікрабіял. працэсы мабілізацыі пажыўных рэчываў, як вынік выдзяляецца шмат вуглякіслага газу.

СПЕ́ЛАСЦЬ ЛЕ́СУ, стан *дрэвастою* або дрэў, пры якім найб. поўна задавальняюцца патрэбы нар. гаспадаркі. Адрозніваюць С.л. прыродную, узнаўляльную, колькасную, тэхн., гасп., спецыяльную. Прыродная С.л. характарызуе стан дрэвастою, калі ён пераходзіць да стадыі адмірання, напр., у сярэдняй паласе ў хвойных дрэў настае ў 200—400, цвердалістых (дуб, клён, граб, ясень) у 300—500 і мяккалістых (бяроза, асіна, вольха, ліпа) у 90—150 гадоў. Узнаўляльная С.л. бывае парасткавая (макс. ўзрост лісцевага дрэвастою, калі ён пры суцэльнай высечцы яшчэ здольны ўзнаўляцца парасткамі) і насенная (мінім. ўзрост дрэвастою, калі ён пры суцэльнай высечцы здольны ўзнаўляцца насеннем). Узросты парасткавай спеласці лісцевых дрэў 40—80, насеннай спеласці хвойных 40—50, лісцевых 20—50 гадоў. Колькасная С.л. характарызуе ўзрост, у якім дрэва або дрэвастой даюць макс. прырост драўніны. Для хвоі і елкі настае ў 60—90, цвердалістых у 60—75, мяккалістых у 35—55 гадоў. Тэхнічная С.л. вызначаецца па ўзросце дрэва або дрэвастою, пры якім яны даюць найб. прырост асн. запланаванага сартыменту. Гаспадарчая С.л. характарызуе ўзрост дрэва або дрэвастою, калі яны даюць найб. грашовы прыбытак за год. Спецыяльная С.л. настае ва ўзросце, у якім максімальна праяўляюцца спец. функцыі лесу (ахоўная, рэкрэацыйная, процізразійная і інш.).

СПЕЛЕАБІЯЛО́ГІЯ, тое, што *біяспелеалогія.*

СПЕЛЕАЛО́ГІЯ (ад грэч. spēlaion пячора + *...логія*), пячоразнаўства, навука, якая вывучае *пячоры.* Даследуе ўмовы іх утварэння, мікраклімат, марфалогію, гідраграфію, расл. і жывёльны свет, выкарыстанне пячор, рэшткі стараж. матэр. культуры, наскальныя і скульптурныя выявы. Падзяляецца на раздзелы: рэгіянальная С., геа-, бія-, антрапа-, палеантаспелеалогія, прыкладная, тэхн. С. Цесна звязана з геолага-геагр. навукамі (у т.л. карстазнаўствам), археалогіяй, біялогіяй і інш.

Пачала фарміравацца ў 2-й пал. 19 ст. У яе развіцці зрабілі ўклад вучоныя: франц. Э.Мартэль (прапанаваў тэрмін «С.» ў 1900), аўстр. А.Шмідль, Ф.Краўс, А. Грунд, амер. У.Дэйвіс, сав. Г.А.Максімовіч, В.М.Дублянскі, М.А.Гваздзецкі і інш. Вял. ўклад у даследаванне пячор спелеолагаў-спартсменаў (спелеатурыстаў). На Беларусі з 1971 дзейнічае клуб спелеатурызму «Гелектыт» (Мінск).

Літ.: Гвоздецкий Н.А. Карст. М., 1981.



А.А.**Спендыяраў**.

СПЕЛЕАФА́УНА (ад грэч. spēlaion пячора + *фауна*), сукупнасць жывёл, што жывуць у *пячорах*, трэшчынах горных парод і інш. месцах гіпагеі (падземнай вобласці жыцця). Вывучае С. *біяспелеалогія*, якая ўключае фрэатабіялогію (навуку аб жывых арганізмах у падземных водах). Прадстаўнікі С. прыстасаваны да спецыфічных умоў гіпагеі (высокай вільготнасці, пастаяннай т-ры, адсутнасці святла і зялёных раслін), выкарыстоўваюць арган. рэчыва, прынесенае з навакольнага асяроддзя (расл. і жывёльныя рэшткі, памёт рукакрылых). Вылучаюць экалагічныя групы: *траглабіёнты* (пастаянныя жыхары гіпагеі), траглафілы (здольныя праходзіць поўны жыццёвы цыкл і ў гіпагеі, і ў інш. падобных умовах) і траглагсены (праходзяць у гіпагеі ч. жыццёвага цыкла).

СПЕНДЫЯ́РАЎ (Спендыяран) Аляксандр Апанасавіч (1.11.1871, г. Кахоўка, Херсонскай вобл., Украіна — 7.5.1928), армянскі кампазітар, дырыжор, педагог; адзін з пачынальнікаў арм. муз. класікі, заснавальнік нац. сімфанізму. Нар. арт. Арменіі (1926). Скончыў Маскоўскі ун-т (1895). Вучань М.*Рымскага-Корсакава*. З 1924 у Арменіі. Вывучаў і творча выкарыстоўваў фальклор розных народаў, у т.л. рус., укр. Развіў традыцыі рус. класічнай муз. школы ў дачыненні да нац. тэматыкі і пры апоры на арм. нар. мастацтва. Стваральнік праграмных сімф. твораў. Сярод твораў: опера «Алмаст» (1928), «Канцэртная увертюра» (1900), 2 сюіты «Крымскія эцюды» (1903, 1912), сімф. карціна «Тры пальмы» (1905), камерна-інстр. творы, хоры, рамансы, апрацоўкі рус. і ўкр. песень і інш.

Літ.: Спендиарова М.А. Летопись жизни и творчества А.А.Спендиарова. Ереван, 1975. *С.Г.Нісневіч.*

СПЕ́НСЕР (Spencer) Герберт (27.4.1820, г. Дэрбі, Вялікабрытанія — 8.12.1903), англійскі філосаф, сацыёлаг і псіхолаг; адзін з пачынальнікаў *пазітывізму*, *дарвінізму сацыяльнага*, *арганічнай школы* ў сацыялогіі, прадстаўнік *асацыянізму*. У 1837—41 працаваў інжынерам на чыгунцы. У 1848—53 супрацоўнічаў у час. «Economist» («Эканаміст»). Філас. погляды С. фарміраваліся пад уплывам А.*Конта*, Д.*Юма*, Дж.С.*Міля*, *кантыянства*, натурфілас. ідэй Ф.В.*Шэлінга* і *шатландскай школы*. Пад філасофіяй разумеў максімальна абагульненыя веды, заснаваныя на канкрэтных навуках. Падзяляў свет на пазнавальнае і непазнавальнае і лічыў, што навуцы даступна пазнанне толькі падабенстваў і адрозненняў паміж з'явамі, а не іх сутнасць. Стрыжань вучэння С. — вучэнне пра ўсеагульную эвалюцыю. Пад эвалюцыяй разумеў бесперапынны рух цялесных часцінак, які прыводзіць да росту ўнутр. дыферэнцыяцыі і адначасова да інтэграцыі. Эвалюцыянізмам тлумачыў усе з'явы — ад неарганічных да сац. і маральных. Свядомасць разглядаў як працэс, які развіваецца ад бязладнай гамагеннасці да гетэрагеннасці і выконвае функцыю адаптацыі арганізма да асяроддзя. Асн. элементамі свядомасці лічыў адчуванні і эмоцыі, якія шляхам ускладнення ператвараюцца ў прадукты вышэйшага парадку. Дынаміку псіхічных працэсаў тлумачыў прынцыпам асацыяцый: асацыяцыі, звязаныя з пачуццём задавальнення, замацоўваюцца і перадаюцца ў спадчыну наступным пакаленням, а звязаныя з адмоўнымі пачуццямі — нівеліруюцца. Сац. структуру грамадства трактаваў па аналогіі з пабудовай і функцыяй жывога арганізма. На яго думку, сац. арганізм складаецца з 3 сістэм: рэгулятыўнай (сац. кантроль, паліт. кіраванне), вытворчай і размеркавальнай. Сутнасць грамадскага прагрэсу бачыў у дасягненні асобай найб. свабоды і звядзенні да мінімуму механізмаў сац. кантролю і кіравання, у пераходзе ад мех. прымусу індывідаў да іх арган. аб'яднання на аснове агульных інтарэсаў. Выступаў супраць ідэй сацыялізму, рэвалюцыю лічыў небяспечнай хваробай сац. арганізма. Вучэнне С. паўплывала на развіццё сучаснай сацыялогіі (культурантрапалогія, *сацыябіялогія*, *структурна-функцыянальны аналіз*) і псіхалогіі (параўнальна-псіхал. даследаванні паводзін, *функцыянальная псіхалогія*).

Тв.: Рус. пер. — Синтетическая философия. Киев, 1997; Основания психологии // Ассоциативная психология. М., 1998; Опыты научные, политические и философские. Мн., 1999. *І.В.Катлярэў.*

СПЕ́НСЕР (Spenser) Эдмунд (каля 1552, Лондан — 13 ці 16.1.1599), англійскі паэт. Вучыўся ў Кембрыджскім ун-це. Магістр (1576). Вядомасць прынесла пастаральная паэма з 12 эклог «Каляндар пастуха» (1579). У сатыр. байцы «Казка матухны Хабард» (1591) і паэме «Вяртанне Коліна Клаўта» (1595) у алегарычнай форме выкрываў прыдворнае жыццё. Аўтар цыкла санетаў «Амарэты» (1591—95), гімнаў. Вяршыня яго паэзіі — алегарычная паэма «Каралева фей» (1590—96, незакончана), прасякнутая гуманіст. імкненнямі; у ёй С. звярнуўся да легенд пра караля Артура і рыцараў Круглага стала, развіваў традыцыі ант. эпасу і паэм італьян. Адраджэння. Узбагаціў англ. вершаскладанне т.зв. *спенсеравай страфой*.

СПЕ́НСЕРАВА СТРАФА́, дзевяцірадковая страфа з рыфмоўкай АбАббВбВВ. Памер першых 8 радкоў — 5-стопны ямб, 9-ы радок напісаны 6-стопным ямбам. Калі твор складаецца з некалькіх С.с., то цотныя пачынаюцца радкамі з жаночай *клаўзулай*, няцотныя — з мужчынскай (або наадварот). Упершыню гэты від страфы ўжыты англ. паэтам 16 ст. Э.*Спенсерам* (адсюль назва) у паэме «Каралева фей». С.с. напісана паэма Дж.Байрана «Паломніцтва Чайльд Гарольда»:

Ты і ў элінаў старажытнай Спарты
Служанкай не лічылася зямной,
А на зямлі, о Муза, нашы барды
Аганьбілі паклёпам і маной
Цябе, дачку нябёс! Ды твой спакой
Не патурбую, хоць і я, бывала,
У Дэльфах быў і храм разглядваў твой
І піў з крыніцы. Без тваёй ухвалы
Аповесць простую пачну пісаць памалу.

(Пер. Р.Барадуліна)

В.П.Рагойша.

СПЕ́РМА (ад грэч. sperma семя), светла-шэрая вадкасць, выдзяляецца пры палавым акце самцамі. Прадукт семяннікоў, *прастаты* і інш. залоз. Складаецца са *сперматазоідаў* і семявай вадкасці. Пры некат. паталаг. станах арганізма бывае *азааспермія*, *алігаспермія*, *некраспермія*.

СПЕРМАТАГЕНЕ́З (ад *сперма* + *...генез*), ператварэнне першасных дыплоідных палавых клетак у жывёл, чалавека і многіх расл. арганізмаў у гаплоідныя дыферэнцыраваныя мужчынскія палавыя клеткі — *сперматазоіды*, або спермії. Адбываецца ў большасці відаў жывёл і чалавека ў семявых канальцах *семянніка*, у гермафрадытных жывёл, як і *аагенез*, у гермафрадытнай *ганадзе*. Адрозніваюць 4 перыяды С.: размнажэнне, рост, дзяленні паспявання і сперміягенез (ці фарміраванне сперміяў). У выніку ператварэння дыплоіднай палавой клеткі ў гаплоідны сперматазоід утвараюцца новыя структуры (акрасома, жгуцік, часта мітахандрыяльнае пабочнае ядро), а большая ч. цытаплазмы разам з рыбасомамі, комплексам Гольджы і эндаплазматычнай сеткай адрываецца. Працягласць С. ад 3 сут (у некат. кішачнаполасцевых) да 80 сут (у чалавека). У жывёл з сезоннымі цыкламі размнажэння перыяд С. больш падоўжаны. Сперматазоіды (антэразоіды) раслін утвараюцца ў *антэрыдыях*. *А.С.Леанцюк.*

СПЕРМАТАЗО́ІД (ад *сперма* + грэч. zōon жывая істота + eidos выгляд), спермій, жыўчык, спелая гаплоідная мужчынская палавая клетка жывёл, чалавека і многіх расл. арганізмаў. Адкрыты А.*Левенгукам* у сперме млека-

кормячых (1677). Утвараецца ў выніку *сперматагенезу* і апладняе *яйцаклетку*. Пасля апладнення ўзнікае *зігота* і пачынаецца развіццё *зародка*. Адрозніваюць С. жгуцікавыя і бязжгуцікавыя. У жывёл даўж. С. звычайна дзесяткі і сотні мікраметраў, у насякомых — да некалькіх міліметраў. Тыповыя жгуцікавыя С. ўласцівы пазваночным жывёлам, чалавеку і большасці беспазваночных. Маюць кароткую, рознай формы галоўку, дзе размешчана ядро, што ўтрымлівае бацькоўскі спадчынны матэрыял. На пярэднім канцы галоўкі звычайна знаходзіцца акрасома, якая забяспечвае пранікненне С. праз яйцавыя абалонкі. Жгуцік (хвост, біч) надае С. паступальны рух у вадкім асяроддзі (пры вонкавым асемяненні ў вадзе, пры ўнутр. — у вадкім змесціве палавых шляхоў). Восевая нітка жгуціка мае бялкі, падобныя на актын і міязін шкілетных мышцаў, здольныя расшчапляць адэназінтрыфосфарную к-ту. Жыццяздольнасць С. ў похве жанчыны да 2,5 гадз, у шыйцы маткі 48 гадз, у палавых шляхах труса да 30 гадз, каня — 5—6 сут, птушак — да 3 тыдняў, пчалы — 3—4 гады. Макс. дзённай прадукцыйнасці С. ў чалавека і труса 10^8, у каня і свінні — больш за 10^{10}. У раслін рухомыя жгуцікавыя С. наз. антэразоідамі. У большасці насенных раслін С. бязжгуцікавыя, актыўна не рухаюцца, наз. спермііямі. *А.С.Леанцюк.*



Сперматазоід млекакормячых жывёл: 1 — галоўка; 2 — шыйка; 3 — прамежны аддзел; 4 — жгуцік; 5 — акрасома; 6 — ядро; 7 — мітахандрыяльная спіраль; 8 — восевая нітка.

СПЕРМАТАФІ́ТЫ, тое, што *насенныя расліны*.

СПЕРМАТАФО́РЫ (ад *сперма* + phoros які нясе), капсулы ў некат. жывёл, запоўненыя *сперматазоідамі*. Выконваюць функцыю іх пераносу і захоўваюць ад высыхання. Могуць доўга знаходзіцца ў арганізме да наступлення апладнення. Асемяненне з удзелам С. — прамежкавае паміж асемяненнем у вадзе і *капуляцыяй* на сушы — характэрнае для п'явак, галаваногіх і некат. бруханогіх малюскаў, шэрагу членістаногіх, для паганафор і некат. земнаводных.

Форма, памеры і спосабы пападання С. ў палавую сістэму самкі розныя. У ракападобных, павукападобных і насякомых у пераносе С. удзельнічаюць канечнасці; у галаваногіх малюскаў адной з «рук», т.зв. гектакотылем, С. пераносяцца ў мантыйную поласць самкі; у некат. васьміногаў гектакотыль, напоўнены С., аддзяляецца ад цела самца, плавае і, калі знаходзіць самку, запаўзае ў яе мантыйную поласць. Самцы трытонаў і саламандраў прыклейваюць С. да якога-н. прадмета, а самка ўцягвае іх клаачнай адтулінай. *А.М.Петрыкаў.*

СПЕРМАЦЭ́Т (ад *сперма* + kētos вялікая марская жывёла), воскападобнае рэчыва, якое выдзяляюць з вадкай тлушчападобнай масы поласцей галавы (т.зв. спермацэтавых мяшкоў) кашалотаў. Раней яго лічылі спермай (адсюль назва). Складаецца з сумесі складаных эфіраў тлустых к-т, пераважна цэтылавага эфіру пальміцінавай к-ты. С. — белыя пласціністыя крышталі, якія добра растваряюцца ў эфіры, ацэтоне, гарачым спірце; $t_{пл}$ = 53—54 °С, добра сплаўляецца з вазелінам, ланалінам, какававым алеем, свіным тлушчам. Выкарыстоўваецца як састаўная ч. асновы мазей, пастаў, касметычных крэмаў.

СПЕ́РМІЙ (ад *сперма*), гаплоідная мужчынская палавая клетка, тое, што *сперматазоід*; таксама бязжгуцікавая мужчынская палавая клетка ў насенных раслін; актыўна не рухаецца.

СПЕ́РЫ (Sperry) Роджэр Уолкат (20.8.1913, г. Хартфард, штат Канектыкут, ЗША — 1994), амерыканскі псіхолаг і нейрафізіёлаг. Чл. Нац. АН ЗША (1960), Амер. акадэміі мастацтваў і навук (1963), Лонданскага каралеўскага т-ва, Папскай акадэміі, замежны чл. Рас. АН (1988). Скончыў Оберлін-каледж (1937). З 1941 у Гарвардскім, з 1946 у Чыкагскім, з 1954 у Каліфарнійскім тэхнал. ун-тах. Навук. працы па нейрафізіял. зроку, функцыян. спецыялізацыі паўшар'яў галаўнога мозга чалавека. Нобелеўская прэмія 1981 (разам з Д.Х.*Х'юбелам* і Т.Н.*Візелам*).

«СПЕЦАЎТАМА́ТЫКА», праектна-канструктарскі інстытут. Засн. ў 1967 у Мінску як буд. мантажна-наладачнае ўпраўленне супрацьпажарнай аўтаматыкі, якое падпарадкоўвалася Гал. ўпраўленню ў Маскве. З 1975 — Мінскі філіял Маскоўскага буд. праектна-канструктарскага бюро «Спецаўтаматыка», з 1.10.1991 — Бел. праектна-канструктарскі ін-т «Спецаўтаматыка», з 1997 — адкрытае акц. т-ва «Белспецпраект», у падпарадкаванні Мін-ва архітэктуры і буд-ва Беларусі. Базавая арг-цыя па стварэнні і абслугоўванні пажарнай і ахоўнай аўтаматыкі і сігналізацыі. Асн. віды дзейнасці: праектаванне, мантаж, наладка і тэхн. абслугоўванне сістэм пажарнай аўтаматыкі і супрацьдымнай засцярогі, сродкаў і сістэм аховы; праектныя работы для буд-ва, пашырэння, рэканструкцыі і капітальнага рамонту аб'ектаў жыллёва-грамадзянскага і вытв. прызначэння; спец. буд.-мантажныя і пуска-наладачныя работы; вогнезасцерагальныя работы па драўніне і драўнінных матэрыялах і інш.



Р.У.**Спе́ры**.

СПЕЦПАСЯЛЕ́НЦЫ, спецперасяленцы, катэгорыя асоб у СССР, якія ў 1930—50-я г. былі сасланы разам з сем'ямі ў аддаленыя раёны краіны (Поўнач, Сібір, Д. Усход і інш.), асабліва ў перыяд масавай *калектывізацыі* ў 1929—32. Тэрміны «С.», «спецперасяленцы» пачалі ўжываць з вясны 1930, як правіла, у адносінах да асоб раскулачаных і сасланых як кулакі. Іх спісы складалі мясц. партыйныя і сав. органы з фармальным прыцягненнем бядняцка-серадняцкага актыву. Умовы транспарціроўкі і жыцця С. былі надзвычай цяжкімі. Яны часта жылі ў пабудаваных імі самімі «асобых паселішчах» і спецпасёлках, прыцягваліся да розных цяжкіх работ. С. пад страхам асуджэння і накіравання ў *папраўча-працоўныя лагеры* забаранялася пакідаць раёны пасялення. Увесь час яны знаходзіліся пад наглядам мясц. органаў дзярж. бяспекі. У 1953—59 праводзілася паэтапнае зняцце абмежаванняў на перамяшчэнне С. на месцы пастаяннага месца жыхарства. *І.М.Кузняцоў.*

СПЕ́ЦЫІ (позналац. species), вострыя пахучыя прыправы (гарчыца, перац, лаўровы ліст, карыца, шафран, ваніль, гваздзіка), якія кладуцца ў ежу для лепшага смаку. Утрымліваюць эфірныя алеі і інш. рэчывы, якія садзейнічаюць засваяльнасці стравы.

СПЕЦЫФІКА́ЦЫЯ, пералік тавараў, якія прапанаваны ў продаж або падлягаюць пастаўцы, дзе ўказаны іх колькасць, гатунак, марка, якасныя характарыстыкі, а пры неабходнасці і цэны. Адрозніваюць С. адгрузачную (таварасправаджальны дакумент на пэўную партыю тавару), С., якая з'яўляецца дадаткам да дагавора, і С., якая дадаецца да разліковых дакументаў.

СПЕ́ЦЫЯ, Ла-Спецыя (Spezia, La Spezia), горад у Паўн. Італіі. Адм. ц. аднайм. правінцыі. Вядомы з 12 ст. Каля 110 тыс. ж. (2000). Порт на беразе зал. Спецыя Лігурыйскага мора. Прам-сць: чорная і каляровая металургія, маш.-буд., у т.л. суднабудаванне, эл.-тэхн.,

радыёэлектронная, ваен., вытв-сць тэкст. і с.-г. машын; нафтаперапр., хім., тэкст., харч., дрэваапр., буд. матэрыялаў. Буйнейшая ў краіне ЦЭС. Музеі: марскі і археалагічны. Арх. помнікі 14—16 ст. Турызм. Ваен.-марская база.

СПЕЦЫЯЛІЗАВА́НЫЯ ЎСТАНО́ВЫ ААН, міжурадавыя арганізацыі па эканам., сац., культ. і інш. гуманітарных галінах, створаныя на аснове міжнар. дагавора і звязаныя з ААН міжнар. пагадненнямі. Іх сувязь з ААН разглядаецца як фактар, закліканы вызначаць такі кірунак дзейнасці дадзенай установы, які адпавядае асноватворным мэтам і прынцыпам ААН. Тым не менш С.ў. ААН — самаст. міжнар. арг-цыі. Структура, кампетэнцыя і інш. пытанні арганізацыі С.у. ААН вызначаны ў міжнар.-прававым парадку дагаворамі, пагадненнямі або ўстаноўчымі актамі, рэгламентамі дзейнасці іх органаў. Істотнае значэнне для дзейнасці С.у. ААН мае Канвенцыя аб прывілеях і імунітэтах С.у. ААН, зацверджаная Ген. Асамблеяй ААН 21.5.1947. Да С.у. ААН поўнасцю прыдатны палажэнні Статута ААН аб суверэннай роўнасці дзяржаў-членаў, аб іх найгалоўнейшых абавязках «развіваць сяброўскія адносіны паміж нацыямі на аснове павагі прынцыпу раўнапраўя і самавызначэння народаў...»

На 1.1.2001 існуе 15 С.у. ААН: *Сусветны паштовы саюз, Міжнародны саюз электрасувязі, Міжнародная арганізацыя грамадзянскай авіяцыі, Арганізацыя Аб'яднаных Нацый па пытаннях адукацыі, навукі і культуры (ЮНЕСКА), Сусветная арганізацыя аховы здароўя, Сусветная метэаралагічная арганізацыя, Міжнародная марская арганізацыя, Сусветная арганізацыя інтэлектуальнай уласнасці, Харчовая і сельскагаспадарчая арганізацыя ААН, Сусветны банк* (уключае *Міжнародны банк рэканструкцыі і развіцця* і *Міжнародную фінансавую карпарацыю), Міжнародную асацыяцыю развіцця, Міжнародны валютны фонд, Міжнародны фонд сельскагаспадарчага развіцця, Міжнародную арганізацыю працы, Арганізацыю Аб'яднаных Нацый па прамысловым развіцці.*

СПЕЦЫЯЛІЗА́ЦЫЯ ВЫТВО́РЧАСЦІ, адна з форм грамадскага *падзелу працы* і яе рацыянальнай арганізацыі, пры якой вытв-сць прадукцыі, асобных яе частак, выкананне асобных аперацый ажыццяўляецца ў самаст. галінах, асобных аб'яднаннях, прадпрыемствах, цэхах, брыгадах, участках; важная ўмова павышэння *эканамічнай эфектыўнасці* вытв-сці. Выяўляецца ў выпуску абмежаванай наменклатуры аднароднай прадукцыі, падобнай канструктыўна, тэхналагічна, а таксама прафес. складам працаўнікоў, выкарыстанай сыравінай. Найб. развіта ў прамысловасці, дзе адрозніваюць тры асн. віды С.в.: прадметную, падэталёвую і тэхналагічную. Прадметная характарызуецца выпускам канструкцыйна і тэхналагічна аднароднай гатовай прадукцыі (аўтамабільны, трактарны, гадзіннікавы з-ды, абутковыя ф-кі). Пры падэталёвай С.в. прадпрыемствы спецыялізуюцца на вытв-сці асобных частак, вузлоў, дэталей гатовай прадукцыі (з-ды маторны, рысорны, шасцерняў, пускавых рухавікоў). Пры тэхналагічнай С.в. асобныя стадыі або аперацыі тэхнал. працэсу вылучаны ў самаст. вытв-сці (ліцейныя, кавальскія цэхі ці з-ды ў машынабудаванні, прадзільныя, ткацкія ф-кі ў тэкст. прам-сці і інш.). У сельскай гаспадарцы С.в. ажыццяўляецца з улікам эканам., сац., ці дэмаграфічных фактараў, спецыфікі с.-г. вытв-сці (прыродных умоў, біял. уласцівасцей раслін і жывёл, асаблівасцей выкарыстання зямлі, прац. і матэрыяльных рэсурсаў, транспартных сродкаў і г.д.). Сельская гаспадарка Беларусі, напр., спецыялізуецца пераважна на мяса-малочнай жывёлагадоўлі, свінагадоўлі, вырошчванні лёну і бульбы. У гаспадарках, у якіх для эфектыўнага выкарыстання зямлі, асн. вытв. фондаў, прац. рэсурсаў узнікае неабходнасць спалучэння гал. галіны ці асн. культуры з дапаможнымі галінамі і культурамі, ажыццяўляецца ўнутрыгасп. спецыялізацыя (механізаваныя звенні па вырошчванні асобных культур, агародныя брыгады, фермы па гадоўлі маладняку, па адкорме жывёлы, малочнатаварныя фермы і інш.). Спецыялізацыя ў будаўніцтве выяўляецца ў стварэнні самаст. буд.-мантажных арг-цый па буд-ве аб'ектаў асобных галін ці выкананні асобных відаў буд.-мантажных работ. Выраб буд. дэталей і канструкцый вылучаецца ў асобныя галіны вытв-сці буд. матэрыялаў. Спецыялізуюцца перавозкі і на транспарце. Напр., танкеры на марскім і рачным, цыстэрны на чыгуначным, рэфрыжэратары на аўтамабільным транспарце; выкарыстоўваюцца *кантэйнерныя перавозкі*. Гл. таксама *Міжнародны падзел працы*.

СПЕЦЫЯ́ЛЬНАСЦЬ (ад лац. specialis асаблівы), комплекс ведаў, уменняў, набытых спец. падрыхтоўкай, вопытам работы і неабходных для працы ў межах пэўнай *прафесіі* (інжынер-будаўнік, інжынер-эканаміст, тэхнік-механік, урач-тэрапеўт, урач-акуліст, слесар-інструментальшчык, слесар-наладчык і інш.). Калі функцыі пэўнай С. пашыраюцца на ўсю прац. дзейнасць работніка, яна адпавядае паняццю «прафесія» (шафёр, газазваршчык, бібліятэкар і інш.). У 2001 у 44 дзярж. і 14 недзярж. ВНУ Беларусі рыхтавалі спецыялістаў па больш як 240 С. па наступных профілях: пед., тэхн., гуманітарным, эканам., прыродазнаўчанавуковым, с.-г., мед. і ваенным; у сярэдніх спец навуч. установах — каля 170, у асн. па тых жа профілях, што і ў ВНУ. У сістэме прафес.-тэхн. адукацыі замест С. прынята назва «рабочая прафесія». У 2001 такіх прафесій было больш як 380. Гл. таксама раздзел Асвета ў арт. *Беларусь*. *І.В.Катляроў.*

СПЕЦЫЯ́ЛЬНАЯ ТЭО́РЫЯ АДНО́СНАСЦІ, гл. ў арт. *Адноснасці тэорыя.*

СПЕЦЫЯ́ЛЬНЫЯ ВО́ЙСКІ, вайсковыя часці і злучэнні, прызначаныя для забеспячэння баявой дзейнасці ўзбр. сіл і выканання спец. задач. Існуюць у шэрагу дзяржаў, у т.л. ў Рэспубліцы Беларусь. Уваходзяць у склад *Тылу* ўзбр. сіл (аўтамаб., *дарожныя войскі* і інш.), відаў узбр. сіл (напр., *мабільныя сілы* — у сухап. войскі, інжынерна-аэрадромныя часці — у ВПС і інш.), а таксама рэзерву, у т.л. стратэгічнага. Напр., у Вял. Айч. вайну 1941—45 некат. злучэнні і часці *інжынерных войск, войск сувязі* былі непасрэдна падпарадкаваны Нар. камісару абароны, Стаўцы Вярх. галоўнакамандавання і інш. органам Дзярж. камітэта абароны.

На тэр. Беларусі ў гады 2-й сусв. вайны дзейнічалі, у т.л. ў складзе *партызанскіх фарміраванняў*, спец. разведвальна-дыверсійныя атрады і інш. спец. падраздзяленні, якія выконвалі адказныя задачы ў інтарэсах сав. войск (гл. *Партызанскі рух на Беларусі* ў Вялікую Айчынную вайну); у перыяд вайны і пасля яе — органы і спец. часці (падраздзяленні) НКУС, Нар. камісарыята абароны (*гл. «Смерш»*) і інш., прызначаныя для барацьбы з дыверсійнай і тэрарыст. дзейнасцю замежных разведак, выканання інш. спец. задач. На тэр. Беларусі ў 1941—44 дзейнічалі і спец. падраздзяленні *абвера, гестапа, СД, СС* і інш. спец. службаў фаш. Германіі.

Ва Узбр. Сілах Рэспублікі Беларусь С.в. ўключаюць: *чыгуначныя войскі*, інж. і хім. войскі, войскі сувязі, злучэнні і часці разведкі, тэхн. і тылавога забеспячэння, а таксама *радыёэлектроннай барацьбы*. Арганізацыя, узбраенне і тэхн. забеспячэнне С.в. залежаць ад іх прызначэння. Шэраг спец. задач, у т.л. па барацьбе з тэрарызмам, ахове грамадскага парадку і інш., выконваюць злучэнні (асобныя брыгады) спец. прызначэння ўзбр. сіл, а таксама некат. часці і падраздзяленні ўнутр. і пагран. войск. Важная роля С.в. належыць у ліквідацыі на тэр. Беларусі наступстваў чарнобыльскай і інш. тэхнагенных катастроф, пры правядзенні размініравання, у барацьбе з паводкамі і інш.

Р.Ч.Лянькевіч, У.І.Свякла.

СПЕЦЫЯ́ЛЬНЫЯ ГІСТАРЫ́ЧНЫЯ НАВУ́КІ, дапаможныя гістарычныя дысцыпліны, зборная назва шэрагу навук. дысцыплін, якія даследуюць асобныя аспекты *гісторыі* грамадства, тэорыі і метадалогіі гіст. навукі, агульныя і канкрэтныя пытанні методыкі і тэхнікі гіст. даследавання. Большасць С.г.н. развілася з т.зв. дапаможных гіст. дысцыплін (гэты тэрмін шырока ўжываўся з канца 19 ст.), да якіх адносілі *этнаграфію, археалогію, антрапалогію, геаграфію гістарычную* і інш. У пасляваенны перыяд гэтыя дысцыпліны ў сувязі з іх пэўнымі дасягненнямі сталі называцца спецыяльнымі. Да канца 20 ст. сфарміраваліся са сваімі прадметамі, аб'ектамі і метадамі даследавання археалогія, *гістарыяграфія*, гіст. геаграфія, гіст. *дэмаграфія, метадалогія* гісторыі, *тапаніміка, фалькларыстыка*,

этналогія (этнаграфія) і інш. Гэтыя навукі маюць багатыя традыцыі, высокі ўзровень развіцця ў свеце і пэўныя дасягненні на Беларусі. Ад С.г.н. адрозніваюць дапаможныя гіст. дысцыпліны, асн. прызначэнне якіх — абслугоўванне гісторыі як навукі, дапамога ў вырашэнні яе гал. задачы — даследаванні мінулага чалавецтва ва ўсёй яго разнастайнасці і канкрэтным праяўленні. Сярод дапаможных гіст. дысцыплін асобнае месца належыць *крыніцазнаўству*, задачай якога з'яўляецца распрацоўка тэорыі, гісторыі і методыкі вывучэння і выкарыстання гіст. крыніц. Дапаможныя гіст. дысцыпліны падзяляюцца на 2 групы: якія вывучаюць розныя віды крыніц, але кожная толькі адзін які-небудзь іх бок (*археаграфія, архівазнаўства, генеалогія, метралогія гістарычная, палеаграфія, тэксталогія*, гіст. *храналогія, эпіграфіка*); якія даследуюць пэўны від крыніц, але з усебаковым разглядам асаблівасцей іх форм і зместу (*геральдыка, дыпламатыка, іканаграфія, нумізматыка, сфрагістыка, філатэлія, фалерыстыка, баністыка, вексілалогія*). Існуюць розныя пункты погляду на склад і колькасць дапаможных гіст. дысцыплін. Так, не прызнаюцца асобнымі дапаможнымі гіст. дысцыплінамі берасталогія, *кадыкалогія*, археалогія і інш. С.г.н. і дапаможныя гіст. дысцыпліны цесна ўзаемазвязаны паміж сабой і інш. гуманітарнымі навукамі; іх даныя выкарыстоўваюцца даследчыкамі комплексна. Пры карыстанні гэтымі тэрмінамі варта ўлічваць іх умоўнасць. У наш час усё больш сціраюцца грані паміж навукамі, якія здабываюць гіст. матэрыял і гіст. інфармацыю з яго, і тымі, што яго выкарыстоўваюць. У канцы 20 ст. ў гіст. навуцы сфарміраваліся т. зв. найноўшыя гіст. навукі — гіст. антрапалогія, *гістарычная інфарматыка*, псіхагісторыя, гістарыясофія, сацыяльная гісторыя, гендэрная гісторыя, вусная гісторыя, гісторыя штодзённасці і інш. Аднак у некат. з іх яшчэ дакладна не сфармуляваны метады, кола крыніц і тэорыя самога прадмета даследавання.

Літ.: Вспомогательные исторические дисциплины. Т. 1—26. Л., 1968—98; Козлов Л.Р. Вспомогательные исторические дисциплины. Мн., 1980; гл. таксама пры арт. пра адпаведныя С.г.н. і дапаможныя гіст. дысцыпліны.

У.М.Міхнюк.

СПЕЦЫЯ́ЛЬНЫЯ ПРАФЕСІ́ЙНА-ТЭХНІ́ЧНЫЯ ВУЧЫ́ЛІШЧЫ (СПТВ), закрытыя навучальна-выхаваўчыя ўстановы, прызначаныя для непаўналетніх правапарушальнікаў ад 14 да 18 гадоў, якія па ўзросце вызвалены ад крымін. адказнасці. Задачы і прынцыпы арганізацыі навучальна-выхаваўчай работы, асаблівасці пед. рэжыму ў СПТВ тыя ж, што і для навучэнцаў *спецыяльных школ*. На Беларусі дзейнічаюць Петрыкаўскае СПТВ № 1 лёгкай прам-сці і Магілёўскае СПТВ № 2 дрэваапрацоўкі.

СПЕЦЫЯ́ЛЬНЫЯ ФУ́НКЦЫІ ў матэматыцы, функцыі розных спец. класаў, якія не выражаюцца праз *элементарныя функцыі*. Прадстаўляюцца з дапамогай спец. шэрагаў або інтэгралаў. Асн. С.ф. з'яўляюцца рашэннямі лінейных дыферэнцыяльных ураўненняў 2-га парадку з пераменнымі каэфіцыентамі, напр., гіпергеам., цыліндрычныя, сферычныя, шаравыя функцыі. Часам да С.ф. адносяць *трансцэндэнтныя функцыі*.

СПЕЦЫЯ́ЛЬНЫЯ ШКО́ЛЫ, закрытыя навучальна-выхаваўчыя ўстановы для дзяцей і падлеткаў 11—14-гадовага ўзросту, якім патрабуюцца асаблівыя ўмовы выхавання. Прызначаны для выпраўлення, сац. рэабілітацыі, прадаўжэння агульнаадук. і прац. навучання непаўналетніх правапарушальнікаў. У С.ш. накіроўваюць падлеткаў паводле рашэння судоў у выпадку ўчынення імі небяспечных дзеянняў або сістэматычных парушэнняў правіл грамадскіх паводзін. Навуч.-выхаваўчая работа ў С.ш. грунтуецца на прынцыпах спалучэння агульнаадук. падрыхтоўкі з грамадска карыснай працай паводле вучэбных планаў і праграм, зацверджаных Мін-вам адукацыі. Ва ўстановах забяспечваецца строгі распарадак дня, кругласутачны нагляд і кантроль за паводзінамі выхаванцаў, які выключае магчымасць іх свабоднага выхаду за межы ўстановы. Мэтанакіраваная арганізацыя жыцця падлеткаў садзейнічае развіццю сацыяльна карысных інтарэсаў і схільнасцей асобы. Гуманныя адносіны да кожнага выхаванца спалучаюцца з высокай патрабавальнасцю і дысцыплінай. Падлеткаў выпускаюць са С.ш. паводле рашэння камісіі па справах непаўналетніх на падставе прапаноў пед. савета. Навучэнцы, якія не выправілі сваіх паводзін, па дасягненні імі 15-гадовага ўзросту могуць быць пераведзены ў *спецыяльныя прафесійна-тэхнічныя вучылішчы*. На Беларусі дзейнічае Магілёўская С.ш.

СПЕ́ЧАНЫЯ МАТЭРЫЯ́ЛЫ, металакераміка, вырабы і паўфабрыкаты з парашкоў металаў і металападобных злучэнняў або іх сумесей з неметал. парашкамі. Атрымліваюць спяканнем — тэрмаапрацоўкай, якая ўшчыльняе свабодна рассыпаную або спрасаваную масу парашку, а таксама фіз. працэсамі, што забяспечваюць запаўненне пор. Адносяцца да *кампазіцыйных матэрыялаў*, выраблены спяканнем парашкоў.

Для аднакампанентнага цела тэхнал. т-ра спякання $t_{сп} = (2/3 — 4/5)t_{пл}$ (цвердафазнае спяканне), для многакампанентнага $t_{сп}$ роўная або некалькі большая за т-ру плаўлення ($t_{пл}$) самага легкаплаўкага кампанента (вадкафазнае спяканне). Аднакампанентныя С.м. на аснове алюмінію з-за аксіднай плёнкі на часцінках парашкоў атрымліваюць вадкафазным спяканнем. Пры выт-сці высакапорыстых С.м. (фільтраў) спяканне можа быць канчатковай аперацыяй, пры атрыманні высокатрывалых С.м. неабходна дапрасоўка і другасное спяканне. Выкарыстоўваюць таксама камбінаваную тэрмамех. апрацоўку — гарачае прасаванне і гарачую коўку, а таксама каліброванне спечаных вырабаў для зніжэння допускаў па памерах. На С.м. порыстасцю менш за 10% можна наносіць зносаўстойлівыя, антыкаразійныя і дэкаратыўныя пакрыцці. Пашыраны цеплаўстойлівыя керамічныя кампазіты (керметы) на меднай і жалезнай сувязной фазе з напаўняльнікамі з аксіду і сіліцыду, гарачатрывалыя С.м. на аснове нікелю і кобальту, антыфрыкцыйныя матэрыялы (алюміній-графіт, жалеза-графіт, высокапаліме-рыграфіт). С.м. выкарыстоўваюцца для вырабу дэталей трансп. сродкаў, машынабудавання, камп'ютэраў, быт. прылад, а таксама ў ядз. тэхніцы як паглынальныя і запавольвальныя элементы, ядз. паліва.

На Беларусі даследаванні па С.м. вядуцца ў Фізіка-тэхн. ін-це Нац. АН Беларусі, Бел. нац. тэхн. ун-це, Канцэрне парашковай металургіі і інш.

Літ.: Вязников Н.Ф., Ермаков С.С. Металлокерамические материалы и изделия. 2 изд. Л., 1967; Порошковая металлургия: Спеченные и композицион. материалы: Пер. с нем. М., 1983; Порошковая металлургия: Материалы, технология, свойства, области применения. Киев, 1985.

А.П.Ласкаўнёў.



Спечаныя матэрыялы: порыстая структура, атрыманая пры спяканні парашкоў бронзы БрОФ 10-1 (павелічэнне × 100).

СПЕ́ШНЕЎ Аляксей Уладзіміравіч (27.3.1911, г. Харкаў, Украіна — 1994), бел. і расійскі кінадраматург, кінарэжысёр. Скончыў кінашколу імя Б.Чайкоўскага ў Маскве (1929). У 1958—67 выкладаў ва Усесаюзным дзярж. ін-це кінематаграфіі. У 1963—73 рэжысёр на кінастудыі «Беларусьфільм». Адзін з першых у сав. ігравым кіно пачаў распрацоўваць жанр паліт. фільма: «Масква—Генуя» (1964, з удзелам рэж. У.Корш-Сабліна і П.Арманда; Дзярж. прэмія Беларусі 1967), «Тысяча акон» (1968), «Чорнае сонца» (1971), «Хроніка ночы» (1973) і інш. Аўтар сцэнарыяў фільмаў «Сябры сустракаюцца зноў» (1939), «Пяты акіян» (1940), «Тахір і Зухра» (1945), «Міклуха-Маклай» (1947), «Алішэр Наваі» (1948), «Пржавальскі» (1952; усе ў сааўт.), «Плата за ісціну» (1979, сцэнарыст і рэж.), п'ес «Падарунак Нептуна» (паст. 1939), «Мадлен Гадар» (паст. 1949), «Дзень спыніць нельга» (паст. 1959) і інш., кн. «Аповесці для кіно» (1972), успамінаў «Бег дзён» (1983), рамана «Трыпціх» (1986).

СПІВА́К Майсей Лейвікавіч (22.12.1919, г. Нароўля Гомельскай вобл. — 23.7.1943), Герой Сав. Саюза (1943). Скончыў палкавую школу (1940). Удзельнік сав.-фінл. вайны 1939—40. У Вял. Айч. вайну з 1941 на Зах. і Цэнтр. франтах. Ад'ю-

тант камандзіра палка лейт. С. вызначыўся 23.7.1943 у баях на Курскай дузе, дзе ў крытычны момант бою павёў у атаку батальён, фарсіраваў р. Неруч, захапіў варожыя траншэі, адбіў 3 контратакі; загінуў у гэтым баі.

СПІВА́К Міхаіл Львовіч (6.12.1913, Кіеў — 27.8.1971), расійскі і бел. рэжысёр. Засл. арт. Беларусі (1959). Скончыў Маскоўскае тэатр. вучылішча імя М.Шчэпкіна (1937). Працаваў у т-рах Масквы, Ташкента і інш. З 1954 рэжысёр, у 1960—64 гал. рэжысёр Дзярж. рус. драм. т-ра Беларусі. Майстар манум. сцэнічных палотнаў. Своеасаблівасць рэжысёрскага мыслення выявілася ў скульптурнай акрэсленасці мізансцэн, дасканалай распрацоўцы масавых сцэн, арган. сінтэзе рэжысуры, сцэнаграфіі і акцёрскай ігры. Сярод пастановак у рус. драм. т-ры: «Мёртвая хватка» Дж.Голсуарсі і «Гандляры славаю» М.Паньёля, П.Нівуа (1956), «Галоўная стаўка» К.Губарэвіча і «Аптымістычная трагедыя» У.Вішнеўскага (1957), «Далі неабсяжныя» М.Вірты (1958), «Барабаншчыца» А.Салынскага (1959), «Улада цемры» Л.Талстога (1960), «Акіян» А.Штэйна (1961), «Дзень нараджэння Тэрэзы» Г.Мдывані (1962), «Узнятая цаліна» паводле М.Шолахава (1963). *А.А.Савіцкая.*

СПІВАКО́Ў Уладзімір Тэадоравіч (н. 12.9.1944, г. Уфа, Башкортастан), расійскі скрыпач, дырыжор. Нар. арт. СССР



Майсей Л.**Співак**.



У.Т.**Співакоў**.

(1990). Нар. арт. Расіі (1999). Скончыў Маскоўскую кансерваторыю (1967, кл. Ю.Янкелевіча). З 1965 канцэртуе. З 1970 саліст Маскоўскай філармоніі. З 1979 маст. кіраўнік і дырыжор арганізаванага ім камернага аркестра «Віртуозы Масквы». З 1990 працаваў пераважна ў Іспаніі. З 1999 гал. дырыжор Рас. нац. сімф. аркестра. 3-я прэмія на Міжнар. конкурсе скрыпачоў імя М.Лонг — Ж.Цібо (1965, Парыж), 2-я прэмія на міжнар. конкурсах імя Паганіні (1967, Генуя) і імя П.Чайкоўскага (1970, Масква), 1-я прэмія на Міжнар. конкурсе скрыпачоў (1969, Манрэаль). Дзярж. прэмія СССР 1989.

СПІДВЕ́Й (англ. speedway ад speed скорасць + way шлях, дарога), матацыклетныя гонкі на гаравых трэках; адзін з відаў *матацыклетнага спорту*. Разнавіднасці С. — гонкі па ледзяной дарожцы стадыёна, па грунтавых і травяных трэках. Спартсмены выступаюць на матацыклах пераважна з аб'ёмам рухавіка 500 см^3 (4 цыліндры), без тармазоў. У гонках па ледзяной дарожцы пакрышкі матацыклетных колаў забяспечваюцца метал. шыпамі.

Чэмпіянаты свету праводзяцца: на гаравых трэках у асабістым заліку з 1934, у камандным — з 1960; сярод пар — з 1970; на лёдзе ў асабістым заліку з 1966, у камандным — з 1978; на грунтавых трэках — з 1971. Найб. пашыраны ў Аўстраліі, Вялікабрытаніі, Новай Зеландыі, Польшчы, Расіі, Швецыі.

СПІДО́МЕТР (ад англ. speed скорасць + *...метр*), прылада, якая паказвае скорасць руху трансп. машыны. Бывае магнітаіндукцыйнага, радзей мех. дзеяння з эл. ці мех. (напр., з дапамогай гнуткага вала) прыводам ад трансмісіі або ад кола машыны. Звычайна са С. спалучаны лічыльны механізм, які паказвае пройдзены машынай шлях.

СПІ́КА, α Дзевы, зорка 1-й візуальнай *зорнай велічыні*, самая яркая ў сузор'і *Дзевы*. Блакітны *гігант* са святільнасцю, большай за сонечную ў 740 разоў. Адлегласць ад Сонца каля 50 пк.

СПІ́КЕР (англ. speaker літар. — аратар, прамоўца), старшыня ніжняй палаты парламента ў англа-саксонскіх краінах, а таксама ў краінах, дзе ў пэўнай ступені прынята такая дзярж.-прававая сістэма (Індыя, Нігерыя і інш.). Фармальна выбіраецца палатай, фактычна — партыямі большасці. У Вялікабрытаніі С. палаты абшчын лічыцца асобай, якая знаходзіцца па-за партыямі. С. кіруе пасяджэннямі палаты, за выключэннем выпадкаў, калі палата ператвараецца сябе ў камітэт палаты. Праз С. палата ажыццяўляе сувязь з кіраўніком дзяржавы.

СПІ́ЛБЕРГ (Spielberg) Стывен (н. 18.12.1947, г. Цынцынаты, ЗША), амерыканскі кінарэжысёр, прадзюсер. Працуе ў жанрах меладрамы, «фільма жахаў», прыгодніцкага фільма і інш. Побач з лаканічнымі па выразных сродках фільмамі «Дуэль» (1971), «Шугарленд-экспрэс» (1974), «Колер ліловы» (1985) стварыў відовішчныя, насычаныя атракцыёнамі стужкі са складанымі трукавымі здымкамі і макетамі: «Сківіцы» (1975), «Шукальнікі страчанага каўчэга» (1981), «Іншапланецянін» (1982), «Індыяна Джонс і храм рока» (1984), «Індыяна Джонс і апошні крыжовы паход» (1989), «Парк юрскага перыяду» (1993) і інш. Рэжысёр фільмаў «Спіс Шындлера» (1993), «Выратаваць радавога Раяна» (1998; абодва прэміі «Оскар», адпаведна 1993, 1998).

СПІН (ад англ. spin вярцецца), уласны *момант імпульсу* элементарнай часціцы ці сістэмы такіх часціц (напр., атамнага ядра, атама). Мае квантавую прыроду, не звязаны з рухам часціцы ў прасторы і не можа тлумачыцца з пазіцыі класічнай механікі. Паняцце С. прапанавана галандскімі фізікамі Дж.Уленбекам і С.Гаўдсмітам (1925); тэорыю С. распрацаваў В.*Паўлі* (1927).

С. часціцы s вымяраецца ў адзінках прыведзенай *Планка пастаяннай*, бывае паўцэлы (у *ферміёнаў*) або цэлы (у *базонаў*) і вызначае яе ўласны *магнітны момант* $\mu = gs$, дзе g — гірамагнітны фактар часціцы. Праекцыя С. на пэўны напрамак — адзін з *квантавых лікаў* (*спіральнасць*); прымае 2s + 1 значэнне праз 1 ад -s да +s. З дапамогай С. растлумачаны структура электронных абалонак атамаў (гл. *Паўлі прынцып*), многія з'явы ферамагнетызму, тонкая і звыштонкая будова атамных спектраў.

СПІ́НАВЫЯ ХВА́ЛІ ў магнітаўпарадкаваных матэрыялах, хвалі парушэнняў «спінавага парадку»; элементарны (найпрасцейшы) рух магн. момантаў у *магнетыках*. Абумоўлены моцным *абменным узаемадзеяннем* паміж атамамі: адхіленне магн. моманту якога-н. атама ад стану раўнавагі не лакалізуецца, а ў выглядзе хвалі распаўсюджваецца ў асяроддзі. Існаванне С.х. прадказана Ф.*Блохам* у 1930. С.х. ў неманітных матэрыялах — ваганні спінавай шчыльнасці электронаў праваднасці, абумоўленыя абменным узаемадзеяннем паміж імі. Праяўляюцца ў некаторых асаблівасцях *электроннага парамагнітнага рэзанансу*, напр., у селектыўнай празрыстасці метал. пласцін для эл.-магн. хваль з частотамі, блізкімі да частаты гэтага рэзанансу.

СПІН-АРБІТА́ЛЬНАЕ ЎЗАЕМАДЗЕ́ЯННЕ, узаемадзеянне часціц, залежнае ад значэнняў і ўзаемнай арыентацыі іх арбітальнага і спінавага *момантаў імпульсу*; адзін з *рэлятывісцкіх эфектаў*. Вядзе да тонкага расшчаплення ўзроўняў энергіі сістэмы (гл. *Тонкая структура*).

Фіз. тлумачэнне С.-а.ў. атрымліваецца, напр., пры разглядзе атама вадароду: электрон, які рухаецца вакол ядра, у дадатак да спінавага магн. моманту (гл. *Спін*) мае арбітальны мех. момант і прапарцыянальны яму арбітальны магн. момант. У выніку С.-а.ў. электрон набывае дадатковую энергію, якая залежыць ад лікавых значэнняў і ўзаемнай арыентацыі арбітальнага і спінавага магн. момантаў электрона. Двум магчымым спінавым станам электрона (праекцыі спіна роўныя +1/2 ці -1/2) адпавядае розная энергія ўзаемадзеяння з арбітальным момантам. У выніку С.-а. ў. ўзроўні энергіі атама вадароду і адпаведныя спектральныя лініі расшчапляюцца на 2 блізкія падузроўні (дублетная структура спектра). *А.А.Богуш.*

СПІ́НІНГ (англ. spinning ад spin вярцецца), рыбалоўная снасць, якая складаецца з вудзільна (даўж. да 3,5 м), шпулі з намаганай лёскай і блясны (штучная прылада, якая нагадвае рыбку). Груз і павадок з блясной і кручком (часам з некалькімі кручкамі) прымацоўваецца да канца лёскі.

СПІННАМАЗГАВА́Я ВА́ДКАСЦЬ, цэрэбраспінальная вадкасць,

л і к в а р, празрыстая бясколерная вадкасць, якая напаўняе поласці *спіннога мозга* і *галаўнога мозга* ў пазваночных жывёл і чалавека.

Мае ў сабе ваду (89%), бялкі (0,22—0,33%), глюкозу, солі, ферменты, лейкацыты (да 5%); мае слабашчолачную рэакцыю (pH 7,4—7,6), удз. в. 1,006—1,007. Утвараецца залозістымі клеткамі сасудзістага спляцення мазгавых жалудачкаў, дыялізам крыві праз сценкі крывяносных капіляраў. Аднаўляецца 4—8 разоў за суткі. Засцерагае мозг пры энергічных рухах галавы, забяспечвае падтрыманне ўнутрычарапнога ціску, пастаянства ўнутр. асяроддзя і ўмовы тканкавага абмену ў ц.н.с. Даследаванне саставу С.в. выкарыстоўваецца для дыягностыкі хвароб ц.н.с. і інш. *А.С.Леанцюк.*

СПІННАМАЗГАВЫ́Я НЕ́РВЫ, сіметрычныя парныя нервы, якія ўтвараюцца карэньчыкамі *спіннога мозга*. Выходзяць з міжпазваночных адтулін С.н. падзяляюцца на галіны: пярэднія і заднія, рэтраградныя абалонкавыя (да абалонак спіннога мозга) і белыя злучальныя (да сімпатычнага ствала). У чалавека 31 пара С.н.: 8 шыйных, 12 грудных, 5 паяснічных, 5 крыжавых, 1 пара хвастцовых. Пярэднія галіны С.н. і ўтвораныя імі шыйнае, плечавое, паяснічнае, крыжавое і хвастцовае спляценні інервуюць скуру, унутр. органы, шкілетныя мышцы цела; заднія — скуру патыліцы, спіны, мышцы задняй паверхні цела. Пашкоджанне С.н. разам з карэньчыкамі прыводзіць да *радыкуліту*, разам са спляценнем — да *плексіту*.

А.С.Леанцюк.

СПІННЫ́ МОЗГ, аддзел *цэнтральнай нервовай сістэмы* пазваночных жывёл і чалавека, размешчаны ў пазваночным канале (гл. *Пазваночнік*). Забяспечвае ажыццяўленне большасці *рэфлексаў*, звязаных з дзейнасцю шкілетна-мышачнай і вісцэральных сістэм.

Мае форму трубкі з патоўшчанымі бакавымі сценкамі, уверсе пераходзіць у прадаўгаваты мозг, унізе (на ўзроўні 2-га паяснічнага пазванка) заканчваецца мазгавым конусам. Укрыты трыма злучальна-тканкавымі абалонкамі: цвёрдай, павуцінай, мяккай; цэнтр. канал і падпавуцінная прастора запоўнены *спінамазгавой вадкасцю*. У дарослага чалавека даўж. С.м. 41—45 см, маса 26—28 г. С.м. утвораны шэрым рэчывам (размешчана ў цэнтры), якое абкружае белае рэчыва. У шэрым рэчыве лакалізуюцца нерв. ядры, у белым праходзяць шляхі, якія злучаюць ц.н.с. з органамі і тканкамі. С.м. складаецца з 31—33 сегментаў, кожны з якіх мае 2 пары нерв. карэньчыкаў: пярэднія, рухальныя (па іх імпульсы з клетак С.м. перадаюцца шкілетным мышцам, унутр. органам) і заднія, адчувальныя (імпульсы ад рэцэптараў скуры, мышцаў, унутр. органаў перадаюцца ў С.м.). Пярэдні і задні карэньчыкі з кожнага боку С.м. злучаюцца паміж сабой і ўтвараюць *спіннамазгавыя нервы*. С.м. залежыць ад *галаўнога мозга*, найб. складаныя рэфлекторныя рэакцыі С.м. кіруюцца галаўным мозгам пры дапамозе праводзячых шляхоў белага рэчыва.

А.С.Леанцюк.

СПІНО́ЗА (Spinoza, d'Espinosa) Бенядзікт (Барух; 24.11.1632, Амстэрдам — 21.2.1677), нідэрландскі філосаф. Паходзіў з яўр. купецкай сям'і. Адукацыю атрымаў у духоўным вучылішчы, якое рыхтавала рабінаў. У 1656 адлучаны ад іудаізму за вальнадумства. У філас.-тэарэт. плане зыходзіў з базавых прынцыпаў *картэзіянства* — рацыяналізму і адмоўнага стаўлення да тэалогіі. Распрацаваў вучэнне пра адзіную прыродную субстанцыю. Прызнаваў тоеснасць Бога і прыроды. Паводле С., прырода з'яўляецца найвышэйшай самаст. нестваральнай і незнішчальнай рэчаіснасцю, дзе зліты ў адно існасць і існаванне. Вылучаў бясконцае мноства атрыбутаў (карэнных уласцівасцей) прыроднай субстанцыі, сцвярджаў, што чалавек здольны ўсвядоміць толькі 2 з іх — мысленне і працягласць. Лічыў, што разнастайныя рэчы пачуццёвага і розумаспасцігальнага свету з'яўляюцца рознымі станамі (модусамі) адзінай субстанцыі. Гнасеалагічныя погляды С. грунтуюцца на ідэі 3 родаў пазнання: пачуццёвае пазнанне (уяўленні, меркаванні), разуменне (развага і розум), інтэлектуальная інтуіцыя (вышэйшы род пазнання, дзякуючы якому спасцігаюцца модусы як формы адзінай субстанцыі). Чалавека разглядаў як частку прыроды, складаны модус, што складаецца з модуса-душы і модуса-цела. Яго этычныя погляды заснаваны на атаясамленні свабоды і пазнання. Паводле С., свабодным чалавекам з'яўляецца той, хто ў сваёй дзейнасці кіруецца розумам. Вучэнні С. пра субстанцыю і прыроду значна паўплывалі на франц. матэрыялізм 18 ст. На Беларусі ў 18 ст. з вальнадумнымі ідэямі С. палемізавалі Г.Каніскі, С.Майман. У 20 ст. ў бел. філасофіі вучэнне С. пра субстанцыю даследавалася С.Я.Вальфсонам, Б.Э.Быхоўскім і інш.



Б.**Спіноза**.

Тв.: Рус. пер. — Соч. Т. 1—2. СПб., 1999; Избранное. Мн., 1999.

Літ.: Соколов В.В. Спиноза. 2 изд.М., 1977; Мудрый и вечно молодой Б.Спиноза: [Сб. ст.]. М., 1999; Федоров А. Спиноза: Жизнь мудреца. Ростов н/Д, 2000. *Т.І.Адула.*

СПІНТАРЫСКО́П (ад грэч. spintharis іскра + *...скоп*), прылада для візуальнага назірання α-часціц; найпрасцейшы *сцынтыляцыйны лічыльнік*. Калі α-часціца трапляе на экран, пакрыты сцынтылявальным рэчывам (напр., сярністы цынк), адбываецца слабая бачная вокам светлавая ўспышка (сцынтыляцыя).

СПІРАГІ́РА (Spirogyra), род ніткаватых зялёных водарасцей сям. спіраґіравых. Каля 340 відаў. Пашыраны ўсюды. Трапляюцца пераважна ў прэсных водах, на вільготнай глебе і інш. На Беларусі 8 відаў С.: бліскучая (S.nitida), зменлівая (S.varians), пагарджаная (S.neglecta), рачная (S.fluviatilis), тоўстая (S.crassa) і інш.

Ніткі даўж. 8—10 см, негалінастыя, плаваюць свабодна або прымацаваныя да субстрату рызоідамі, часта ўтвараюць «ціну». Ніткі складаюцца з аднаго рада клетак, якія маюць цэлюлозную абалонку, абкружаную слізню. Перыферыйны хларапласт у выглядзе закручаных стужак. Размнажэнне вегетатыўнае (разрыў ніткі) і палавое (лесвічная і бакавая кан'югацыя). *Т.М.Міхеева*

СПІРА́ЛІ (франц. spirales ад лац. spira выгін), 1) плоскія крывыя *лініі*, што закручваюцца (раскручваюцца) вакол некаторага фіксаванага пункта і з кожным абходам набліжаюцца (аддаляюцца) да яго. Напр., *архімедава спіраль*, *лагарыфмічная спіраль*, спіраль Карню і інш. Выкарыстоўваюцца пры графічным рашэнні некаторых задач дыфракцыі, у некаторых канструкцыях развадных мастоў, пры праектаванні фрэз, труб. 2) Прасторавыя крывыя лініі, што закручваюцца вакол вызначанай восі, напр. *вінтавая лінія*.

СПІРА́ЛЬНАРАСНІ́ЧНЫЯ ІНФУЗО́РЫІ (Spirotricha), або р о з н а р а с н і ч н ы я і н ф у з о р ы і (Heterotricha), падклас прасцейшых кл. раснічных інфузорый. 3 атр., каля 2 тыс. відаў. Пашыраны ў прэсных вадаёмах. Жывуць свабодна або прымацаваныя да субстрату. Удзельнічаюць у біял. ачышчэнні вады. Ёсць паразіты, узбуджальнікі хвароб жывёл і чалавека. На Беларусі найб. трапляюцца бурсарыя трункатэла (Bursaria truncatella), спірастомум малы (Spirostomum minus), стыланіхія мітылюс (Stylonichia mytilus), трубачы: блакітны (Stentor coeruleus) і зменлівы (S.polymorphus).



Спіральнараснічныя інфузоры: 1 — бурсарыя трункатэла; 2 — стыланіхія мітылюс; 3 — трубач блакітны.

СПІРА́ЛЬНАРАСНІ́ЧНЫЯ ІНФУЗО́РЫІ (Spirotricha), або р о з н а р а с н і ч н ы я і н ф у з о р ы і (Heterotricha), падклас прасцейшых кл. раснічных інфузорый. 3 атр., каля 2 тыс. відаў. Пашыраны ў прэсных вадаёмах. Жывуць свабодна або прымацаваныя да субстрату. Удзельнічаюць у біял. ачышчэнні вады. Ёсць паразіты, узбуджальнікі хвароб жывёл і чалавека. На Беларусі найб. трапляюцца бурсарыя трункатэла (Bursaria truncatella), спірастомум малы (Spirostomum minus), стыланіхія мітылюс (Stylonichia mytilus), трубачы: блакітны (Stentor coeruleus) і зменлівы (S.polymorphus).

Даўж. да 3 мм. Цела ўкрыта шчыльнай *пелікулай* з густымі раснічкамі (органы перамяшчэння), некат. маюць ракавіну. Каляротавыя раснічкі (2—4 рады) злітыя паміж сабой (т.зв. мембранелы), якія спіральна закручаны па гадзіннікавай стрэлцы (адсюль назва), даўжэйшыя за астатнія (адсюль другая назва). Кормяцца дробнымі арган. рэшткамі, бактэрыямі, водарасцямі, прасцейшымі. Корм для інш. беспазваночных, малявак рыб.

А.М.Петрыкаў.

СПІРА́ЛЬНАСЦЬ, адна з квантава-мех. характарыстык (*квантавых лікаў*) стану *элементарных часціц*. Вызначаецца як праекцыя *спіна* на напрамак руху часціцы. Бывае дадатная і адмоўная. Лічаць, што пры дадатнай С. часціца мае прававінтавую (правую) С., пры адмоўнай — левавінтавую (левую) С.

СПІРА́ЛЬНАЯ АНТЭ́НА, дыяпазонная *антэна* бягучай хвалі. Выпрамяняе і прымае эл.-магн. хвалі з эліптычнай ці кругавой палярызацыяй. Бывае плоская і прасторавая. Выкарыстоўваецца як самастойная антэна, а таксама як апрамяняльнік люстраных і лінзавых антэн пераважна ў сантыметровых і дэцыметровых дыяпазонах хваль.



Спіральныя антэны: плоскія а — архімедава і б — лагарыфмічная; прасторавыя в — цыліндрычная і г — канічная спіралі (1 — кааксіяльная лінія сувязі, 2 — металічны экран, 3 — металічная спіраль).

СПІРАХЕТО́ЗЫ, група інфекцыйных хвароб чалавека і жывёл, якія выклікаюцца патагеннымі *спірахетамі*. Падзяляюцца на кішэчныя С. (*лептаспірозы*), крывяныя С., што перадаюцца вошамі і кляшчамі (*зваротныя тыфы*), палавым шляхам (*сіфіліс*), С. краін трапічнага пояса (напр., пінта). Да С. адносяцца таксама хваробы, якія выклікаюцца асацыяцыяй спірахет і бактэрый (напр., язвавы стаматыт). Лячэнне індывід. для кожнага выпадку. На С. хварэюць свойскія птушкі (куры, асабліва куранятыя, гусі), трусы (хвароба цягнецца хранічна).

СПІРАХЕ́ТЫ (Spirochaetales), парадак бактэрый. 1 сям., 8 родаў. С. — водныя сапратрофы, жывуць свабодна; крысціспіры — селяцца ў малюсках; дыплакаліксы, пілатыны, халандыны — у тэрмітах; трэпанемы, барэліі, лептаспіры — паразіты жывёл і чалавека (узбуджальнікі сіфілісу, лептаспірозу, зваротнага тыфу і інш.).

Клеткі доўгія і тонкія, спіральна закручаныя. Плавальныя рухі С. забяспечвае сістэма восевых фібрыл. Грамадмоўныя. Аэробы, факультатыўныя або абавязковыя (аблігатныя) анаэробы. Хемаарганагетэратрофы. Спор не ўтвараюць. Размнажаюцца дзяленнем.

А.І.Ерашоў.

СПІРТАВА́Я ПРАМЫСЛО́ВАСЦЬ, галіна *харчовай прамысловасці*, якая вырабляе этылавы спірт-сырэц і спірт-рэктыфікат з харчовай сыравіны (збожжа, бульбы, мелесу). Асн. спажыўцы этылавага спірту — харч. прам-сць, медыцына, радыёэлектроніка.

На Беларусі ў 19 ст. С.п. займала вядучае месца ў структуры харч. прам-сці. У 1890 у 5 бел. губернях налічвалася 376 спіртзаводаў (вінакурняў). У 1913 працавала 568 спіртавых і рэктыфікацыйных з-даў, на якіх было занята 4,5 тыс. рабочых і выпрацавана 3,7 млн. дэкалітраў спірту. Большасць спіртзаводаў была сканцэнтравана ў сярэдняй паласе, дзе размяшчаліся асн. пасевы бульбы. У 1940 працавала 137 спіртзаводаў, выраблена 7,6 млн. дэкалітраў спірту. Буйнейшымі прадпрыемствамі былі Урэцкі, Багушэўскі, Дземяхоўскі спіртзаводы. У пасляваен. гады колькасць прадпрыемстваў С.п. скарачалася ў сувязі з недастатковасцю сыравіннай базы. У 2000 працавалі 74 прадпрыемствы, у т.л. спецыялізаваныя па вырабе спірту-сырцу (Івацэвіцкі, Бераставіцкі, Бярэзінскі, Хатаўскі, Каўгарскі спіртзаводы), па вырабе спірту-рэктыфікату (Бродніцкі крухмальны з-д, Варанчанскі, Міёрскі, Парэцкі, Урэцкі спіртзаводы). Вытв-сць спірту склала 6,1 млн. (1960), 7,2 млн. (1990) і 10,4 млн. дэкалітраў (2000).

У свеце С.п. найб. развіта ў ЗША, Германіі, Францыі, Канадзе, Вялікабрытаніі, Расіі, Бразіліі, Польшчы.

П.І.Рогач.

СПІРТАВО́Е БРАДЖЭ́ННЕ, гл. ў арт. *Браджэнне*.

СПІРТАМЕ́Р, назва *арэометра* для вызначэння мацунку водна-спіртавых раствораў па іх шчыльнасці.

СПІРТЫ́, алкаголі, алканолы, арганічныя злучэнні, малекулы якіх маюць адну або некалькі гідраксільных (—OH) груп пры насычаных атамах вугляроду. Паводле колькасці OH-груп адрозніваюць С. аднаатамныя (напр., *метылавы спірт, этылавы спірт*), двухатамныя, ці *гліколі*, трохатамныя (напр., *гліцэрына*) і шмататамныя, ці паліолы [напр., $C(CH_2OH)_4$ пентаэрытрыт]. Аліфатычныя аднаатамныя С. паводле характару вуглевадароднага радыкала, злучанага з OH-групай, падзяляюць на першасныя RCH_2OH, другасныя R_2CHOH і трацічныя R_3COH. Злучэнні з OH-групай пры падвойнай вуглярод-вугляроднай сувязі наз. еноламі (звычайна няўстойлівыя), пры атамах вугляроду араматычнага кальца — *феноламі*. У прыродзе С. ў выглядзе складаных эфіраў ёсць у ліпідах, восках, эфірных алеях, трапляюцца і ў свабодным стане (напр., у язмінным алеі ёсць *бензілавы спірт*, у ружавым — фенетылавы $C_6H_5CH_2CH_2OH$).

Бясколерныя вадкасці або цвёрдыя рэчывы, добра растваральныя ў большасці арган. растваральнікаў. Аднаатамныя аліфатычныя С. з 1—3 атамамі вугляроду ў малекуле змешваюцца з вадой у любых суадносінах, вышэйшыя (маюць больш за 6 атамаў вугляроду) практычна нерастваральныя. Пры павелічэнні колькасці OH-груп у малекуле растваральнасць С. узрастае; паліолы раствараюцца ў вадзе неабмежавана. С. праяўляюць слабыя кіслотныя ўласцівасці — з актыўнымі металамі ўтвараюць солі — алкагаляты. Для С. характэрныя рэакцыі акіслення, дэгідратацыі, утварэння простых і складаных эфіраў. Атрымліваюць С. гідратацыяй алкенаў, гідролізам галагеналканаў, аднаўленнем аксіду вугляроду, альдэгідаў, кетонаў і інш. спосабамі. Выкарыстоўваюць у вытв-сці сінт. валокнаў, фарбавальнікаў, пахучых рэчываў, лек. прэпаратаў, мыйных сродкаў і інш., як растваральнікі. Гл. таксама *Амілавыя спірты, Бутылавыя спірты, Ізапрапілавы спірт, Цыклагексанол, Этыленгліколь.*

Я.Г.Міляшкевіч.

СПІРУЛІ́НА (Spirulina), род ніткаватых сіне-зялёных водарасцей (цыянабактэрый) сям. асцыляторыевых. Каля 30 відаў. Трапляюцца ў вадаёмах, тэрмальных крыніцах, глеі, глебе. На Беларусі 9 відаў С.: вялікая (S.major), Гомана (S.gomontiana), Джэнера (S.jenneri), прасторнейшая (S.laxissima) і інш.

Ніткі адзіночныя, часам скручаныя ў форме спіралі, сіне-зялёныя, радзей жоўта-зялёныя, здольныя да вярчальнага і паступальнага руху. Размнажаюцца мнагаклетачнымі фрагментамі нітак (гармагоніямі). Асобныя віды ядомыя. Культывуюцца для вырабу лекаў, біял. дабавак, атрымання харч. бялку.

Т.М.Міхеева.

СПІРЫ́ДА Макар Іванавіч (1867, в. Семернікі Ашмянскага р-на Гродзенскай вобл. — 1950), бел. нар. казачнік. У 1894—1910 працаваў на тэкстыльнай фабрыцы ў прадмесці Нью-Йорка. Расказваў казкі землякам, якія збіраліся ў яго, каб паспяваць бел. нар. песні, паслухаць творы вуснай фантазіі роднага краю. Вярнуўшыся ў родную вёску, быў вядомы ў акрузе як славуты апавядальнік. Добра валодаў родным словам, дыялогам персанажаў, тонкім гумарам. Асаблівасці яго рэпертуару тыповыя для традыц. зах.-бел. фальклору. У 1948 ад яго рабіў запісы Л.Р.Бараг. Казкі С. ўвайшлі ў зб. на ням. мове «Беларускія народныя казкі» (1966, 10-е выд., 1980).

Літ.: Бараг Л. Беларуская казка. Мн., 1969. С. 241—242.

І.У.Саламевіч.

СПІРЫДЗЕ́НКА Мікалай Кузьміч (12.1.1917, в. Беразуга Шумілінскага р-на Віцебскай вобл. — 27.12.1980), Герой Сав. Саюза (1945), ген.-маёр (1961). Скончыў Барысаглебскую ваен. авіяшколу лётчыкаў (1938), акадэміі Ваеннапаветр. (1950) і Генштаба (1957). З 1937 у Чырв. Арміі. Удзельнік сав.-фінл. вайны 1939—40. У Вял. Айч. вайну з 1941 на Паўн.-Зах., Паўд.-Зах., Зах., 2-м Бел. франтах. Камандзір эскадрыллі маёр С. зрабіў 337 баявых вылетаў, удзельнічаў у 85 паветр. баях, збіў асабіста 15, у

групе — 6 самалётаў праціўніка. Да 1970 у Сав. Арміі, у 1962—70 выкладчык ваен. акадэміі.

СПІРЫДО́НАВА Марыя Аляксандраўна (28.10.1884, г. Тамбоў, Расія — 11.9.1941), расійскі паліт. дзеяч. З 1900—01 чл. тамбоўскай арг-цыі *сацыялістаў-рэвалюцыянераў* (эсэраў), потым — эсэраўскай баявой дружыны. 29.1.1906 смяротна параніла тамбоўскага губ. саветніка Г.М.Лужаноўскага — кіраўніка мясц. чарнасоценцаў і арганізатара жорсткіх карных акцый супраць сялян. Пры арышце зазнала катаванні, суд. працэс над ёй меў шырокі грамадскі рэзананс. Прыгаворана да смяротнага пакарання, замененага бестэрміновай катаргай. Пасля Люг. рэвалюцыі 1917 вызвалена і стала адным з лідэраў левага крыла эсэраў. Прызнала Кастр. рэвалюцыю 1917. З ліст. 1917 чл. ЦК партыі *левых эсэраў*, чл. Прэзідыума ВЦВК, дэлегат 3—5-га з'ездаў Саветаў Расіі. Адзін з арганізатараў *леваэсэраўскага мяцяжу 1918*, пасля падаўлення якога прыгавораны да 1 года зняволення (амнісціравана ВЦВК). Пазней неаднаразова арыштоўвалася сав. ўладамі, у т.л. ў студз. 1919 у Мінску; з 1923 у ссылцы. У люг. 1937 беспадстаўна абвінавачана ў тэрарыст. дзейнасці, у студз. 1938 асуджана на 25 гадоў зняволення; расстраляна паводле прыгавору Ваен. калегіі Вярх. суда СССР.

Літ.: Гусев К.В. Эсеровская богородица. М., 1992; Кравченко Т.Ю. Возлюбленная террора. М.; Смоленск, 1998. *Э.А.Ліпецкі.*

СПІРЫДО́НАЎ Мікалай Васілевіч (н. 15.3.1943, Бішкек), бел. вучоны ў галіне тэхналогіі машынабудавання. Д-р тэхн. н. (1990), праф. (1994). Скончыў БПІ (1965). З 1970 у БПА (з 1977 заг. лабараторыі). Навук. працы па пытаннях тэхналогіі і абсталявання для павышэння трываласці паверхняў з выкарыстаннем высокаканцэнтраваных патокаў энергіі (плазменных, лазерных і інш.). Распрацаваў фіз. і матэм. мадэлі тэхналагічных працэсаў умацавання дэталей машын.

Тв.: Плазменные и лазерные методы упрочнения деталей машин. Мн., 1988 (разам з А.С.Кабяковым, І.Л.Купрыянавым); Композиционные армированные газотермические покрытия для вытяжки проволоки // Машиностроение: Респ. межвед. сб. науч. тр. Мн., 2000. Вып. 16.

СПІРЫДО́НАЎ Міхаіл Фёдаравіч (н. 10.4.1937, г. Бабруйск Магілёўскай вобл.), бел. гісторык. Канд. гіст. навук (1982). Скончыў Маскоўскі ун-т (1960). З 1960 працаваў настаўнікам. З 1965 у Ін-це гісторыі Нац. АН Беларусі. Вывучае агр. эвалюцыю на Беларусі 15—16 ст., гіст. картаграфію 16—17 ст. Адзін з аўтараў прац «Гісторыя сялянства СССР са старажытнейшых часоў да Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі» (т. 2, 1990), «Нарысы гісторыі Беларусі» (ч. 1, 1994), «Гісторыя сялянства Беларусі» (т. 1, 1997).

Тв.: Закрепощение крестьянства Беларуси (XV—XVI вв.). Мн., 1993; Беларусь на карце Вялікага княства Літоўскага 1613 г. // З глыбі вякоў: Наш край: Гіст.-культурал. зб. Мн., 1997. Вып. 2; Метрика Великого княжества Литовского как источник по истории поселений // Lietuvos Metrika, 1991—1996 metų tyrinėjimai. Vilnius, 1998; Заславль в XVI в. Мн., 1998.

СПІРЫ́ЛЫ (новалац. spirilla памяншальнае ад лац. spira выгін), бактэрыі, якія маюць форму спіральна-звілістых або дугападобных палачак. Асн. роды: спірылы, акваспірылы, акіянаспірылы. Жывуць у вадаёмах, глебе, трапляюцца ў страўніку жывёл.

Дыяметр клетак 0,2—1,7 мкм, даўж. спіралі 0,5—60 мкм. Рухаюцца з дапамогай аднаго або некалькіх біпалярных жгуцікаў. Грамадмоўныя. Аэробы, анаэробы і мікрааэрафілы (растуць толькі пры нізкім утрыманні кіслароду). Хемаарганатрофы. Спор не ўтвараюць.

А.І.Ерашоў.

СПІ́РЫН Аляксандр Сяргеевіч (н. 4.9.1931, г. Калінінград Маскоўскай вобл., Расія), расійскі вучоны ў галіне



М.К.**Спірыдзенка**.



А.С.**Спірын**.

біяхіміі. Акад. Рас. АН (1970, чл.-кар. 1966). Скончыў Маскоўскі ун-т (1954). З 1954 у Ін-це біяхіміі Рас. АН (заг. лабараторыі), з 1964 у Маскоўскім ун-це (заг. кафедры). У 1967 арганізаваў і ўзначаліў Ін-т бялку Рас. АН. Навук. працы па біяхіміі нуклеінавых к-т і біясінтэзе бялкоў. Адкрыў інфармасомы (1964). Ленінская прэмія 1976. Дзярж. прэмія Расіі (1988).

СПІРЫТУАЛІ́ЗМ (франц. spiritualisme ад лац. spiritualis духоўны, spiritus душа, дух), філасофскі кірунак, згодна з якім дух разглядаецца ў якасці першаасновы рэчаіснасці, асаблівай бесцялеснай субстанцыі, што існуе незалежна ад матэрыі. Як філас. тэрмін уведзены франц. філосафам 19 ст. В.Кузэнам. У далейшым С. наз. шэраг школ у франц. і італьян. філасофіі 19—20 ст. (Э.Бутру, А.Разміні-Сербаці, Ш.Рэнуўе, А.Бергсон і інш.). У шырокім сэнсе да С. адносяцца ўсе рэліг. вучэнні, у аснове якіх вера ў існаванне Бога і бессмяротнасць душы, філас. кірункі старажытнасці і Новага часу, якія грунтуюцца на ідэі субстанцыянальнасці духоўнага пачатку.

СПІРЫТЫ́ЗМ (франц. spiritisme ад лац. spiritus душа, дух), містычны кірунак, прыхільнікі якога вераць у пасмяротнае існаванне душ памерлых і магчымасць кантактаў з імі пры дапамозе пасрэднікаў (*медыумаў*). Вытокі С. ў *анімізме* і *шаманстве*. Як масавы містычны рух С. аформіўся ў 19 ст. ў ЗША і распаўсюдзіўся па ўсім свеце. У практыцы С. выкарыстоўваюцца прыёмы т.зв. «фізічнага медыумізму»: «столакручэнне», варажба на сподках і інш.

СПІ́РЫЧУЭЛ (ад англ. spiritual song духоўная песня), жанр амерыканскай духоўнай музыкі; някультавае песнапенне. Узнік на Пд ЗША на аснове афр. і англа-кельцкіх традыцый, быў пашыраны ў 2-й пал. 18 ст. — 1870-х г. Перадае настроі трагічнай адзіноты, вылучаецца паэт. глыбінёй. З 1930-х г. адроджаны на канцэртнай эстрадзе (П.*Робсан*, Махалія *Джэксан*, М.*Андэрсан*, Л.*Прайс*, Р.Чарлз, Р.Тарп), з 1960-х г. развіваецца у межах *поп-музыкі*.

СПІРЭ́Я (Spiraea), род кветкавых раслін сям. ружавых. Каля 100 відаў. Пашыраны ва ўмераным і субтрапічным паясах Паўн. паўшар'я. На Беларусі ў культуры 36 відаў і некалькі разнавіднасцей С.: белая (S.alba), дубраўкалістая (S.chamaedryfolia), сярэдняя (S.media), японская (S.japonica) і інш.

Лістападныя кусты выш. 15—300 см. Сцёблы прамастойныя, панікліыя або сцелістыя. Лісце чаргаванае, простае, па краі зубчастае. Кветкі белыя, ружовыя, чырв. ў парасона-, шчыткападобных або мяцёлчатых суквеццях. Плод — шматлістоўка. Меданосныя, дэкар. расліны. *А.М.Скуратовіч.*

СПІС ВЫ́БАРШЧЫКАЎ, спіс грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у *выбарах, рэферэндуме, галасаванні* аб адкліканні дэпутата. Паводле Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь С.в. складаюцца па кожнаму ўчастку і падпісваюцца старшынёй і сакратаром участковай камісіі. У С.в. уключаюцца ўсе грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якія дасягнулі на дзень галасавання 18 гадоў, пастаянна або часова пражываюць на тэр. дадзенага ўчастка і маюць права ўдзельнічаць у галасаванні. У С.в. грамадзянін можа быць уключаны толькі на адным участку. С.в. прадстаўляюцца для ўсеагульнага азнаямлення за 15 дзён да галасавання (на ўчастках, утвораных у санаторыях, дамах адпачынку, бальніцах і інш. такіх установах — за 2 дні да галасавання). Кожны грамадзянін мае права абскардзіць неўключэнне, няправільнае ўключэнне або выключэнне са С.в., інш. недакладнасці. Такія скаргі разглядае ўчастковая камісія, апеляцыі на іх рашэнні — вышэйстаячая камісія. Скаргі на рашэнні ўчастковай камісіі могуць таксама падавацца ў раённы або гар. суд, рашэнні якіх з'яўляюцца канчатковымі. *Г.А.Маслыка.*

СПІТАМЕ́Н (грэч. Spitamenēs), сагдыйскі военачальнік, кіраўнік паўстання ў Сярэдняй Азіі (у *Согдзе* і *Бактрыі*) супраць Аляксандра Македонскага ў 329 да н.э. У 328 да н.э. С. забіты сваімі саюзнікамі (правадырамі качавых плямён), якія баяліся помсты Аляксандра. Паўстанне задушана ў 327 да н.э. Гл. таксама *Сагдыйцы*. *А.Г.Зельскі.*

СПІЦ (Spitz) Марк (н. 10.2.1950, г. Мадэста, штат Каліфорнія, ЗША), амерыканскі спартсмен (плаванне). Чэмпіён XIX і XX Алімп. гульняў (1968, Мехіка — у эстафетах 4 × 100 м і 4 × 200 м вольным стылем; 1972, г. Мюнхен, Германія — на дыстанцыях 100 і 200 м вольным стылем, 100 і 200 м батэрфляем, у эстафетах — 4 × 100 м і 4 × 200 м вольным стылем і камбінаванай 4 × 100 м). Сярэбраны прызёр XIX Алімп. гульняў на дыстанцыі 100 м батэрфляем і бронз. прызёр на дыстанцыі 100 м вольным стылем. Рэкардсмен свету (1967—77) на розных дыстанцыях.

А.М.Петрыкаў.

СПІЦЫН Аляксандр Андрэевіч (26.8.1858, г. Яранск Кіраўскай вобл., Расія — 17.9.1931), расійскі археолаг. Чл.-кар. АН СССР (1929). Скончыў Пецярбургскі ун-т (1882). З 1892 чл. Археалагічнай камісіі, з 1919 чл. Рас. акадэміі гісторыі матэрыяльнай культуры. Вывучаў і сістэматызаваў усх.-слав. старажытнасці, адзін з першых пачаў спалучаць археалогію з гісторыяй. Абагульніў і апублікаваў матэрыялы археал. раскопак, якія праводзілі ў бас. Нёмана В.А.*Шукевіч*, Ф.В.*Пакроўскі* і Э.А.*Вольтэр*. У 1893 на 9-м археал. з'ездзе ў Вільні выступіў з дакладам аб каменных магілах і курганах Беларусі, у 1926 на 1-м з'ездзе даследчыкаў бел. археалогіі і археаграфіі — аб сучасным становішчы бел. археалогіі. Аўтар прац: «Магчымыя літоўскія курганы VIII—IX ст.» (1896), «Магчымыя старажытнасці Чорнай Русі» і «Расселенне старажытнарускіх плямён па археалагічных даных» (1899), «Літоўскія старажытнасці» (1925) і інш.

В.У.Скалабан.

СПІЧ (ад англ. speech прамова), кароткая прывітальная застольная прамова.

СПЛА́ВІНА, з ы б у н, 1) слой воднай і балотнай расліннасці, які нарастае ад берага да цэнтр. часткі вадаёма. У вадаёмах, багатых пажыўнымі рэчывамі, складзена з карэнішчавых раслін (чарот, рагоз, бабок трохлісты, капытнік) і брыевых імхоў, у бедных — у асн. са сфагнавых імхоў. Адарваныя ад берага ўчасткі С. часам утвараюць плаваючыя астравы. 2) Слой слабараскладзенага торфу з ачосам, які ўсплывае на паверхню вадасховішчаў у месцах затаплення тарфяных балот. Адзначаюцца ў першыя гады існавання вадасховішчаў.

СПЛА́ВЫ, макраскапічна аднародныя рэчывы, атрыманыя пераважна сплаўленнем металаў, неметалаў, аксідаў, арган. рэчываў і інш. Адрозніваюць С. неметалічныя, атрыманыя сплаўленнем неметал. рэчываў (напр., сілікаты прыродныя — граніт, базальт, гнейс і штучныя — шкло, шлакі), і металічныя, ці С. металаў. У тэхніцы найб. пашыраны С. металаў (асн. від канстр. матэрыялаў). Многія ўласцівасці С. (трываласць, цвёрдасць, эл. супраціўленне) значна вышэйшыя, чым у чыстых *металаў*.

С. м е т а л а ў — цвёрдыя крышт. рэчывы, атрыманыя сплаўленнем 2 і больш металаў ці (радзей) металаў і неметалаў (гл. *Жалезавугляродзістыя сплавы*), з характэрнымі метал. ўласцівасцямі. Структура і ўласцівасці С. залежаць ад іх хім. саставу, характару ўзаемадзеяння кампанентаў, умоў крышталізацыі, мех. і тэрмічнай апрацоўкі. Сувязь паміж саставам, будовай і ўласцівасцямі С. вывучае *металазнаўства*. Паводле структуры С. падзяляюць на аднафазныя (гамагенныя) і шматфазныя (гетэрагенныя), якія маюць некалькі фаз; асобнымі фазамі ў С. з'яўляюцца *цвёрдыя растворы* і інтэрметалічныя злучэнні (гл. *Металіды*), якія ўтвараюцца пры сплаўленні кампанентаў. Паводле характэрных уласцівасцей адрозніваюць *лёгкія сплавы*, *легкаплаўкія сплавы*, тугаплаўкія, высокатрывалыя (напр., *высокатрывалая сталь*), гарачатрывалыя (гл. *Гарачатрывалыя матэрыялы*), *цвёрдыя сплавы* і інш. Фіз.-хім. асновай стварэння С. з'яўляецца *дыяграма стану*. Асн. метад атрымання — *крышталізацыя* з расплаву, атрымліваюць таксама метадам *парашковай металургіі*. Для паляпшэння ўласцівасцей С. ажыццяўляюць *легіраванне*. С. ў выглядзе тонкіх плёнак і пакрыццяў атрымліваюць асаджэннем з газавай фазы, напыленнем, кандэнсацыяй пары, электролізам. Паводле тэхнал. уласцівасцей адрозніваюць С. для апрацоўкі ціскам (гл. *Апрацоўка металаў ціскам*) і *ліццём* (ліцейныя С.), паводле прызначэння — канстр. (пераважна розныя маркі *сталі* і *чыгуну*) для вырабу дэталей машын, буд. канструкцый і інш. збудаванняў, інстр. пераважна для вырабу вымяральных і металаапрацоўчых інструментаў, электратэхн. (напр., *медныя сплавы*, *медна-нікелевыя сплавы*), трыбатэхн. (гл. *Антыфрыкцыйныя матэрыялы*), каразійнаўстойлівыя (гл. *Каразійнаўстойлівыя матэрыялы*) і інш. Гл. таксама *Вальфрамавыя сплавы*, *Малібдэнавыя сплавы*, *Нікелевыя сплавы*, *Свінцу сплавы*.



Спірэя: 1 — шарсцістая; 2 — сярэдняя; 3 — вербалістая; 4 — бярозалістая.



Сплахнум: 1 — жоўты; 2 — чырвоны; 3 — бутэлькападобны.

Літ.: Савицкий А.П. Жидкофазное спекание систем с взаимодействующими компонентами. Новосибирск, 1991.

А.П.Ласкаўнёў.

СПЛАНХНАПТО́З (ад грэч. splanchna вантробы + ptōsis падзенне), зрушэнне ўнутраных органаў у ніз у параўнанні з іх нармальным месцазнаходжаннем. Абумоўлены анамаліямі развіцця органаў, аслабленнем тканак і інш. Адрозніваюць С. канстытуцыянальны (залежыць ад *канстытуцыі чалавека*) і набыты (напр., пасля паўторнай цяжарнасці і родаў). Часцей бывае С. органаў брушной поласці, таксама лёгкіх, сэрца і інш.

СПЛА́ХНУМ (Splachnum), род брыевых імхоў сям. сплахнавых. 8 відаў. Пашыраны ў арктычных і субарктычных шыротах. На Беларусі 1 від — С. бутэлькападобны (S.ampullaceum). Трапляецца ў сырых вярбоўніках, на вільготных пашах і балотах.

Адна- і двухдомныя лістасцябловыя расліны. Утвараюць рыхлыя дзярнінкі. Сцёблы даўж. 1—9 см, з чырв. рызоідамі. Лісце шырокаяйцападобнае або ланцэтнае, суцэльнакрайняе ці зубчастае. Каробачка прамастойная, на доўгай ножцы. Каўпачок канічны.

СПЛАШНО́Ў Сяргей Іванавіч (10.9.1907, Масква — 6.4.1979), бел. кінарэжысёр. Засл. дз. маст. Беларусі (1970). Скончыў Дзярж. тэхнікум кінематаграфіі ў Маскве (1928). Працаваў на кінастудыях «Міжрабпом-Русь» і «Ленфільм». З 1933 на «Беларусьфільме», дзе паставіў фільмы: маст. «Мянтуз», «Маска» (абодва 1938), «Песня пра дружбу» (1941, з І.Шапірам), «Зялёныя агні» (1955, з І.Шульманам), «Нашы суседзі» (1957), «Каханнем трэба даражыць» (1959), «Цешча» (1973) і інш.; дакумент. і навук.-папулярныя «Нашы дзеці» (у саўт.), «Мінск адраджаецца» (абодва 1945), «Выяўленчае мастацтва БССР» (1958), «Вясёлка над Нёманам» (1970), «Родная зямля» (1972), «Паслуга за паслугу» (1977) і інш.

СПЛІТ (Split), горад на Пд Харватыі. Каля 300 тыс. ж. (2000). Порт на Адрыятычным моры. Кліматычны курорт, цэнтр турызму. Міжнар. аэрапорт. Прам-сць: суднабуд., цэм., хім., харчасмакавая, тэкстыльная. ГЭС. Біёлага-акіянаграфічны НДІ. Музеі: марскі, археал., этнагр., харвацкіх старажытнасцей, мастацкая галерэя і інш. Помнікі стараж.-рым., у т.л. руіны палаца імператара Дыяклетыяна (каля 300), сярэдневяковай і рэнесансавай (11—16 ст.) архітэктуры. Паблізу руіны ант. г. Салона (2 ст. да н.э. — 4 ст. н.э.).

У старажытнасці грэч. паселішча Аспалатхас. Каля 300 н.э. рым. імператар *Дыяклетыян* пабудаваў тут сваю рэзідэнцыю. У 7 ст. ў С. перасяліліся бежанцы з разбуранага аварамі і славянамі г. Салона. У 9—12 ст. С. — рэзідэнцыя вышэйшага духавенства *Далмацыі*. З 1069 пад уладай Харвацкай дзяржавы. У 1105—1420 (з перапынкам у 1327—57) у Венгерскім каралеўстве. У 13—14 ст. буйны гандл. цэнтр. Да 1420 самакіравальная камуна з уласным статутам (1312). У 1420—1797 належаў Венецыі, потым (з перапынкам у 1806—13) — Аўстрыі. З 1918 у складзе Каралеўства сербаў, харватаў і славенцаў (з 1929 Югаславія). У 2-ю сусв. вайну адзін з цэнтраў антыфаш. руху Супраціўлення. З 1991 у незалежнай Харватыі.

СПЛЮ́ШКА, соўка-сплюшка (Otus scops), птушка роду совак сям. савіных атр. совападобных. Пашырана ў Еўразіі і Паўн. Афрыцы. Жыве ў лісцевых і мяшаных лясах, парках, садах. Актыўная ўначы. На Беларусі рэдкі гнездавальны і пралётны від, занесена ў Чырв. кнігу. Зімуе ў тропіках Афрыкі і Паўд.-Зах. Азіі.

Даўж. да 22 см, маса да 100 г. Апярэнне спіны буравата-шэрае з рыжым адценнем, з цёмным падоўжным і папярочным малюнкам; брушка больш светлае, з цёмнымі падоўжнымі стракацінамі. Цэўка і плюсна аперыя, пальцы голыя. Гняздуе ў дуплах, старых гнёздах інш. птушак, у збудаваннях. Адкладвае да 7 яец. Корміцца насякомымі, павукамі, дробнымі птушкамі, мышападобнымі грызунамі.

Э.Р.Самусенка.



Сплюшка.

СПО́ВЕДЗЬ, пакаянне, адно з 7 хрысціянскіх *таінстваў*, якое заключаецца ў прызнанні вернікам сваіх грахоў перад святаром, які дазвольнымі (магічнымі) словамі ад імя Ісуса Хрыста адпускае грахі хрысціяніну, што шчыра пакаяўся. У 2—3 ст. у хрысц. абшчынах склалася дэталёвая рэгламентацыя пакаяння за розныя катэгорыі праграшэнняў (смяротныя, прабачальныя) перад абшчынай (публічная С.). Звычай публічнай С. існаваў да 7 ст., пазней пачала пераважаць індывід. тайная С. перад святаром. Формула абавязковай тайнай С., прадпісаная IV Латэранскім саборам (1215) і зацверджаная Трыдэнцкім саборам (1545—63), прадугледжвала неабходнасць пакаяння для ўсіх католікаў «разумнага ўзросту» не радзей як адзін раз на год. У рус. праваслаўі тайная С. узаконена ў 17 ст. Захаванне тайны С. ўстанаўлялася ў якасці абавязковага патрабавання дэкрэтамі пап Клімента VIII і Інакенція XI, аднак некаторыя тэолагі абгрунтоўвалі магчымасць яе парушэнняў у надзвычайных выпадках. У Расіі ў 1722 царскі ўказ абавязваў святароў даносіць пра выяўленыя на С. замахі супраць дзярж. і царк. улад. С. звязана з гал. хрысц. таінствам — *прычасцем* (еўхарыстыяй), якому яна, як правіла, папярэднічае. Сярэдневяковыя ератычныя рухі і пратэстанты рашуча адвяргалі права святароў адпускаць грахі на С., назначаць адкупныя пакаранні, выдаваць *індульгенцыі*. Пратэстантызм захаваў С. толькі як традыц. царк. абрад, які выяўляе пакаянне і шкадаванне хрысціяніна пра ўчыненыя ім грахі, пазбавіўшы яго характару таінства.

СПО́ДАЧКІ, марскія сподачкі, 3 сямействы (Patellidae, Tecturidae, Lepetidae) падкл. пярэдняшчэлепных малюскаў кл. бруханогіх. Пашыраны ў морах усіх акіянаў. Найб. вядомая патэла чарнаморская (Patella pontica).



Да арт. **Сподачкі**. Патэла чарнаморская.

Дыяметр ракавіны да 25 см. Ракавіна спрошчаная, сім., мае форму каўпачка або перакуленага ўверх дном сподачка (адсюль назва). Маюць адно перадсэрдзе, рэдукаваныя шчэлепы. Раздзельнаполыя, некат. гермафрадыты. Апладненне вонкавае. Некат. ядомыя.

СПОК (Spock) Бенджамін Маклейн (2.5.1903, г. Нью-Хейвен, штат Канектыкут, ЗША — 15.3.1998), амерыканскі педыятр, педагог і грамадскі дзеяч. Скончыў Ельскі ун-т (1925) і мед. курсы пры ім (1929). У 1933—44 займаўся прыватнай практыкай у Нью-Йорку. У 1944—46 на вайсковай службе, у 1947—50 ад'юнкт-праф. Мінесоцкага ун-та, у 1951—55 кіраваў аддзяленнем дзіцячай псіхіятрыі пры мед. курсах Пітсбургскага ун-та. У кн. «Дзіця і яго догляд» (1946) абагульніў свой вопыт педыятра, выклаў уяўленні пра ўзаемаадносіны бацькоў і дзяцей, развіццё здаровай і шчаслівай асобы. Гал. ідэя С. — прызнанне адметнасці, унікальнасці асобы дзіцяці; ён раіў бацькам пазбягаць крайнасцей у выхаванні, праяўляць чуласць і ўлічваць жаданні дзіцяці, дамагацца такіх адносін з дзецьмі, калі адпадае неабходнасць у пакаранні. Важнейшым у выхаванні лічыў «метад цярпення», адначасова падкрэсліваў асн. ролю бацькоўскага аўтарытэту, які не мае нічога агульнага з дыктатам, значэнне дысцыпліны для выхавання. У шматлікіх публікацыях выказаў свае ідэі па

пед. праблемах: выхаванне прыёмных і «цяжкіх» дзяцей, выхаванне ў няпоўнай сям'і, уплыў на дзяцей сямейных канфліктаў і разводаў, роля бацькі ў выхаванні і інш. Сваю грамадскую дзейнасць разглядаў як працяг гуманістычнай педагогікі.

Літ.: Азаров Ю. Диалог: Заметки о Бенджамине Споке и о современ. пробл. воспитания // Новый мир. 1979. № 9—10.

СПО́НДЫ, вёска ў Астравецкім р-не Гродзенскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 54 км на ПнУ ад г.п. Астравец, 304 км ад Гродна, 59 км ад чыг. ст. Гудагай. 120 ж., 46 двароў (2001). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі.

СПО́НКА, рака ў Веткаўскім і Добрушскім р-нах Гомельскай вобл., левы прыток р. Сож (бас. р. Дняпро). Даўж. 23 км. Пл. вадазбору 218 км^2. Пачынаецца на паўд. ускраіне в. Барба, вусце за 1 км на З ад в. Рудня-Споніцкая. Рэчышча амаль на ўсім. працягу каналізаванае.

СПО́НСАРСТВА (ад лац. spondeo ручаюся, гарантую), добраахвотнае фінансаванне якой-н. фізічнай або юрыд. асобай пэўнай дзейнасці канкрэтных прадпрыемстваў, арг-цый, т-ваў, фіз. асоб. Ажыццяўленнем такога фінансавання спонсар гарантуе плацежаздольнасць гэтых асоб. Звычайна С. практыкуецца для падтрымкі мерапрыемстваў дабрачыннага характару, творай, спартыўнай, экалагічнай дзейнасці і да т.п. Гл. таксама *Мецэнацтва*.

СПО́НЦІ Яўген Ігнатавіч (1866—17.3.1931), удзельнік рэв. руху ў Беларусі і Расіі. Скончыў Паўлаўскае пях. вучылішча ў Пецярбургу (1887), служыў у Троіцкім пях. палку ў Вільні. У 1889 звольнены са службы, з 1892 вёў прапаганду ў с.-д. гуртках у Вільні. З 1893 у Маскве, наладзіў сувязі з кіраўнікамі марксісцкага гуртка, у 1894 выдаў першыя ў Маскве с.-д. лістоўкі; чл. Цэнтр. групы па прапагандзе сярод рабочых, якая стала ядром Маскоўскага рабочага саюза. У 1895 выехаў у Зах. Еўропу для наладжвання сувязей з групай «Вызваленне працы». Пасля вяртання арыштаваны і сасланы ў Архангельск. З 1899 чыг. служачы ў Мінску, прадстаўнік гар. арг-цыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў. У 1905 арыштаваны, у далейшым ад рэв. дзейнасці адышоў. У 1923—25 працаваў каморнікам у Мінску.

С.В.Пазняк.

СПО́РАВА, вёска ў Бярозаўскім р-не Брэсцкай вобл., на паўн.-зах. беразе воз. Спораўскае. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 33 км на ПдУ ад г. Бяроза, 135 км ад Брэста, 8 км ад чыг. ст. Белаазёрск. 1359 ж., 440 двароў (2001). Сярэдняя школа, Палац культуры, б-ка, амбулаторыя, аптэка, аддз. сувязі. Брацкая магіла партызан. Каля вёскі 2 стаянкі эпохі неаліту.

СПО́РАВА-ПЫЛКО́ВЫ АНА́ЛІЗ, батанічны метад даследавання, які дазваляе вызначыць таксанамічную прыналежнасць раслін паводле марфал. асаблівасцей іх спор і пылковых зерняў. Вонкавыя абалонкі спор і пылковых зерняў маюць у сабе воскападобныя рэчывы і добра захоўваюцца ў геал. адкладах. Споры аналізуюць пры вывучэнні адкладаў палеазою і часткова мезазою (панаванне споравых раслін), пылок — пры вывучэнні адкладаў палеагену, неагену і антрапагену (панаванне кветкавых раслін). С.-п. а. выкарыстоўваецца ў *паліналогіі*, геалогіі, геамарфалогіі, палеагеаграфіі, кліматалогіі, стратыграфіі, таксама ў сістэматыцы раслін, медыцыне (для вызначэння паходжання некат. алергічных хвароб).

СПО́РАВЫЯ РАСЛІ́НЫ, філагенетычна гетэрагенная група раслін, якія размнажаюцца і распаўсюджваюцца пераважна спорамі, што ўтвараюцца бясполым і палавым шляхам. Да іх адносяць *водарасці* і вышэйшыя С.р. (*мохападобныя, дзеразападобныя, хвошчападобныя, папараці*, шэраг выкапнёвых раслін), а таксама *лішайнікі* і *грыбы*. Бясполае размнажэнне грыбоў, водарасцей і лішайнікаў адбываецца рухомымі *зааспорамі*, нерухомымі апланаспорамі, спарангіяспорамі; палавое — *ааспорамі*, зігаспорамі; таксама магчыма вегетатыўнае размнажэнне (*аідыі, хламідаспоры*, гемы). У вышэйшых С.р. бясполае размнажэнне адбываецца спорамі, што ўтвараюцца ў *спарангіях спарафітаў*. С.р. процілстаўляюць насенным раслінам — *голанасенным* і *пакрытанасенным*, што размнажаюцца і распаўсюджваюцца *насеннем*.

СПО́РАЎСКАЕ БАЛО́ТА, адна з назваў *Пушыцавага балота*.

СПО́РАЎСКАЕ ВО́ЗЕРА. На мяжы Бярозаўскага і Драгічынскага р-наў Брэсцкай вобл., у бас. р. Ясельда (цячэ праз возера), за 26 км на ПдУ ад г. Бяроза. Пл. 11,5 км^2, даўж. 5,6 км, найб. шыр. 3 км, найб. глыб. 2,2 м, даўж. берагавой лініі 19,5 км. Пл. вадазбору 3 тыс. км^2. Катлавіна складаецца з 2 плёсаў. Схілы нізкія, забалочаныя, на ПнЗ выш. да 5 м, часткова параслі хмызняком. Берагі забалочаныя, тарфяністыя, на Пн пясчаныя. Дно да глыб. 0,5—0,7 м пясчанае, цэнтр. ч. выслана сапрапелем. Мінералізацыя вады да 200 мг/л. Празрыстасць 0,5 м. Эўтрофнае. Ледастаў з пач. снеж. да канца сакавіка. Зарастае падводнай расліннасцю. Шыр. прыбярэжнай паласы надводнай расліннасці 150—200 м, пашырана да глыб. 0,5 м. У возера ўпадаюць р. Плёса і некалькі меліярац. каналаў.



Спораўскае возера.

СПО́РАЎСКІ, біялагічны заказнік рэсп. значэння на тэр. Бярозаўскага, Драгічынскага, Іванаўскага і Івацэвіцкага р-наў Брэсцкай вобл. Засн. ў 1991 (пашыраны ў 1999) для аховы унікальных мезатрофных нізінных балот, эталонных участкаў балотна-лугавых і лясных угоддзяў з комплексамі рэдкіх і знікаючых відаў раслін і жывёл. Пл. 19 384 га (2000). Ландшафты старажытна-алювіяльных нізінных раўнін з шырокімі і слаба дрэніраванымі поймамі і надпоймавымі тэрасамі, азёрамі, катлавінамі. Разнатраўна-гіпнава-асаковыя лугі і гіпергідрафільныя травяністыя фітацэнозы займаюць 74%, лясы (карэнныя пушыстабярозавыя, чорнааль-ховыя, хваёвыя) і хмызнякі — 9,6% тэрыторыі. У флоры 543 віды раслін, з іх 11 у Чырв. кнізе: венерын чаравічак сапраўдны, пылкагалоўнік чырвоны, тайнік яйцападобны і інш. У фауне 20 відаў млекакормячых, 112 — птушак, 6 — рэптылій, 8 — амфібій, з іх 22 у Чырв. кнізе: паганка малая, бугай вялікі і малы, бусел чорны, падворлік малы, арлан-белахвост, чарапаха балотная, чмялі мохавы і Шрэнка і інш.

П.І.Лабанок.

СПОРАЎТВАРЭ́ННЕ, спорагенез, працэс утварэння *спор*.

У ніжэйшых арганізмаў споры ўзнікаюць з цэлай клеткі (экзаспоры шэрагу сіне-зялёных водарасцей), пры дзяленні пратапласта (эндаспоры некат. сіне-зялёных водарасцей), шляхам ушчыльнення і сціскання пратапласта ўнутры абалонкі клеткі і ўтварэння паверх яго новай мнагаслойнай абалонкі (у бактэрый). У грыбоў споры ўтвараюцца пры распадзе асобных участкаў міцэлію на членікі (напр., у актынаміцэтаў), або на вырастах міцэлію — *канідыяносцах* ці ў *спарангіях*. У большасці вышэйшых раслін С. адбываецца ў спарангіях, у выніку якога ўтвараюцца меяспоры.

С.І.Бельская.

СПОРТ (ад англ. disport гульня, забава), спаборніцкая дзейнасць, спец. падрыхтоўка да яе (спарт. трэніроўка) і спецыфічныя адносіны, нормы і дасягненні, якія ўзнікаюць на аснове сукупнасці ўсіх відаў такой дзейнасці. Гістарычна склалася пераважна ў сферы *фізічнай культуры*. У больш вузкім сэнсе С. — спаборніцтвы, накіраваныя непасрэдна на дэманстрацыю фіз. дасягненняў, аб'ектыўнага параўнання і ацэнкі пэўных магчымасцей чалавека (сіл, здольнасцей, уменняў).

Першыя спаборніцтвы ўзніклі ў старажытнасці ў форме ініцыяцый — рытуалаў пасвячэння юнакоў у воіны. У далейшым спа-

борніцтвы набылі сакральны (магічны) характар. Захаваліся гістарычна дакладныя звесткі аб правядзенні рытуальных спаборніцтваў у Месапатаміі (з 4-га тыс. да н.э.), Егіпце, Індыі, Кітаі (з 3—2-га тыс. да н.э.). У Стараж. Грэцыі склалася цэлая сістэма спаборніцтваў, якія прысвячаліся антычным багам і героям: *Немейскія гульні, Істмійскія гульні, Піфійскія гульні, Алімпійскія гульні* і інш. Сучасны С. склаўся ў пач. 19 ст. ў Англіі як сац. інстытут прафіляванага развіцця фіз., псіхічных і інш. здольнасцей чалавека з мэтай іх супараўнання ва ўмовах рэгламентаванай спаборніцкай дзейнасці.

Вызначаюць 3 асн. ўзаемазвязаныя арганізац. формы С.: масавы (рэкрэацыйны), рэзервовы і С. вышэйшых дасягненняў. С. масавы (С. для ўсіх) з'яўляецца ч. фіз. культуры, ахоплівае практычна ўсе сац. групы насельніцтва і садзейнічае фіз. выхаванню, аздараўленню, арганізацыі вольнага часу, пашырэнню адносін і інш. С. рэзервовы ўключае сістэму адбору і падрыхтоўкі юных спартсменаў (напр., сістэма *спартыўных школ*). С. вышэйшых дасягненняў уключае С. рэкордны і відовішчна-камерцыйны. Арганізатарам рэкорднага С. выступае дзяржава; яна ажыццяўляе ўмовы для падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спартсменаў і каманд, выкарыстоўвае іх дасягненні дзеля фарміравання прэстыжу краіны на міжнар. арэне. На гэтай аснове рэкордны С. звязваецца з дзярж. палітыкай. Мэта відовішчна-камерцыйнага С. — атрыманне непасрэднага прыбытку ад арганізацыі спарт. відовішча. У гэтай сувязі ён набывае рысы шоу-бізнесу. Сац. значэнне С. пашыраецца ў сувязі з узнікненнем новых арганізац. захадаў, рэарганізацыі і будаўніцтва новых *спартыўных збудаванняў*, пашырэння *спартыўных спаборніцтваў* і інш. Важным фактарам развіцця С. з'яўляецца прапаганда яго ў сродках масавай інфармацыі, выяўленчым мастацтве, кіно, літаратуры і інш.

Літ.: Матвеев Л.П. Введение в теорию физической культуры. М., 1983; Визитей Н.Н. Физическая культура и спорт как социальное явление: Филос. очерки. Кишинев, 1986; Кулинкович Е.К. Спорт: люди и рекорды. Мн., 1998; Пономарчук В.А., Козлова В.С. Институт спорта: (история и реалии). Мн., 2002. *Я.К.Кулінковіч.*

«СПОРТИ́ВНАЯ ПАНОРА́МА», бел. спартыўная газета. Выдаецца з 1.6.1951 у Мінску, напачатку пад наз. «Физкультурник Белоруссии» («Фізкультурнік Беларусі»), з 1995 — сучасная назва. Выходзіць 5 разоў на тыдзень на рус. мове. Заснавальнік — Мін-ва спорту і турызму Рэспублікі Беларусь, калектыў рэдакцыі. Асвятляе спарт. жыццё Беларусі і інш. краін свету, пытанні алімп. руху, здаровага ладу жыцця. Змяшчае нарысы пра вядучых спартсменаў, матэрыялы аб спаборніцтвах, дасягненнях спарт. калектываў і спартсменаў.

СПО́РЫ (ад грэч. spora сяўба, семя), клеткі грыбоў і раслін, што служаць для размнажэння і рассялення. Узнікаюць шляхам *мітозу* (мітаспоры ў грыбоў і ніжэйшых раслін) ці *меёзу* (меяспоры ў вышэйшых раслін). Меяспоры бываюць аднолькавыя (у раўнаспоравых) або 2 тыпаў — мікра- і *мегаспоры* (у разнаспоравых). Паводле месца ўтварэння адрозніваюць эндаспоры, што фарміруюцца ў *спарангіях*, і экзаспоры, што ўтвараюцца на паверхні (напр., у некат. плесневых грыбоў). У ніжэйшых раслін, якія селяцца ў вадзе, С. маюць жгуцікі для перамяшчэння (напр., *зааспоры* ў водарасцей). У наземных раслін С. разносяцца ветрам і інш. агентамі, не маюць органаў руху, ахаваны ад высыхання цвёрдай клетачнай абалонкай. Памеры ад 3—5 да 25—50 мкм, маюць разнастайную форму. Тэрмін жыцця зааспор ад некалькіх мінут да 2—3 гадз, С. у абалонцы — ад 10 дзён да 3—5 гадоў, С. галаўнёвых грыбоў — да 25 гадоў. Марфал. і антагенет. асаблівасці С. — важная таксанамічная адзнака, якая выкарыстоўваецца ў *спорава-пылковым аналізе*. У паразітычных прасцейшых кл. *спаравікоў* С. — адна- ці мнагаклетачныя ўтварэнні, абкружаныя шчыльнай абалонкай. Служаць для распаўсюджвання і перажывання неспрыяльных умоў. Бактэрыйныя С. — рэпрадуктыўныя клеткі, што знаходзяцца ў спакоі. Характарызуюцца паніжаным узроўнем метабалізму і асобнай ультраструктурнай арганізацыяй. Утвараюцца ў канцы жыццёвага цыкла. Асн. функцыя — рэпрадукцыя і (або) захаванне бактэрый у неспрыяльных умовах навакольнага асяроддзя. Устойлівыя да высокіх т-р, радыяцыі, высушвання, уздзеяння растваральнікаў і інш. неспрыяльных фактараў, што выклікаюць гібель вегетатыўных клетак. У пажыўным асяроддзі С. прарастаюць і даюць пачатак новым вегетатыўным бактэрыяльным клеткам. *С.І.Бельская.*

СПО́РЫ, возера ў Пастаўскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Мядзелка, за 5 км на ПдЗ ад г. Паставы. Пл. 0,7 км², даўж. каля 1,5 км, найб. шыр. 840 м, найб. глыб. 20,8 м, даўж. берагавой лініі 4,9 км, пл. вадазбору 48 км². Катлавіна эварзійнага тыпу. Схілы выш. 10—20 м, на Пн і З параслі лесам, на ПдУ і У разараныя. Берагі нізкія, пад хмызняком, месцамі зліваюцца са схіламі. Ёсць 3 вял. залівы, востраў пл. 1,5 га. Дно зах. ч. катлавіны лейкападобнай формы, усх. — плоскае. Мелкаводдзе пясчанае, глыбакаводная ч. выслана ілам. Зарастае да глыб. 4,5—5,2 м. Праз возера цячэ р. Спорыца (злучае яго з азёрамі Світка і Задзеўскае), упадае ручай з воз. Сморкі.

СПО́САБ ВЫТВО́РЧАСЦІ, гістарычна вызначаны спосаб здабывання матэрыяльных даброт; адзінства матэрыяльных *прадукцыйных сіл* і грамадскіх *вытворчых адносін*. Тэрмін «С.в.» ўведзены К.Марксам для абазначэння эканам. асновы грамадства, якая, на яго думку, характарызуе сферу вытв. дзейнасці людзей і вызначае сац., паліт. і духоўныя працэсы іх жыццядзейнасці. Для кожнага С.в. характэрны пэўны ўзровень прадукц. сіл і іх выкарыстання ў прац. працэсе (напр., *машынная вытворчасць*, створаная ў выніку *прамысловага перавароту*). Аб'ектыўнае развіццё прадукц. сіл апярэджвае рост вытв. адносін, што з цягам часу пачынае негатыўна адбівацца на тэмпах эканам. развіцця і абумоўлівае неабходнасць змены аднаго С.в. на іншы, больш прагрэсіўны. Адносіны паміж людзьмі ў працэсе вытвсці набываюць сваё выяўленне ў пэўнай форме ўласнасці (прыватная, дзярж., кааператыўная і інш.), якая і вызначае канкрэтны С.в. У краінах са змешанай эканомікай, у т.л. ў Рэспубліцы Беларусь, адбываецца пераход ад цэнтралізаванай планавай вытв-сці з дзярж. уласнасцю на яе сродкі да сацыяльна арыентаванай рыначнай эканомікі з перавагай прыватнай уласнасці, але пры захаванні вядучай ролі дзяржавы ў планаванні эканам. і сац. развіцця краіны. *М.В.Радзіеўскі.*

СПРАВАВО́ДСТВА, парадак вядзення спраў, дакументацыі ва ўстановах, арг-цыях і фірмах, на прадпрыемствах. Уключае: прыём, запаўненне, афармленне, адпраўку дакументаў, улік і кантроль за іх рухам і выкананнем, захоўванне і абнаўленне дакументаў. У С. ўваходзіць таксама складанне дзелавых папер (пасведчанне, даведка, суправаджальныя паперы і г.д.). Правілы С. распрацоўваюцца ў адпаведнасці з рэгламентам або статусам устаноў (арг-цый, прадпрыемстваў, фірмаў), з улікам патрабаванняў законаў Рэспублікі Беларусь.

СПРАВАЗДА́ЧНАСЦЬ, сістэма паказчыкаў, якая характарызуе вынікі работы прадпрыемства (установы, арг-цыі, фірмы) за пэўны перыяд. Дае магчымасць рабіць абагульняльныя вывады пра эканам. дзейнасць галіны, рэгіёна і ўсёй нар. гаспадаркі краіны, весці кантроль за гасп. і фін. дзейнасцю дзярж. прадпрыемстваў. Падаецца вышэйшым галіновым арг-цыям, а таксама органам статыстыкі, Мін-ву фінансаў і Нацбанку Рэспублікі Беларусь. Адрозніваюць С.: статыстычную (па асобных відах дзейнасці) і бухгалтарскую (па ўсёй дзейнасці), унутрыгадавую (пяцідзённую, дэкадную, месячную, квартальную, паўгадавую) і гадавую. Статыстычная С. падзяляецца на агульнадзяржаўную, унутрыведамасную, тыпавую і спецыялізаваную. Агульнадзяржаўная — абавязковая для прадпрыемстваў і арг-цый усіх мін-ваў і ведамстваў рэспублікі; унутрыведамасная (галіновая) ужываецца толькі ў межах пэўнай галіны; тыпавая — агульная для ўсіх галін эканомікі; спецыялізаваная ўжываецца ў галінах, якія маюць спецыфічныя асаблівасці. Гл. таксама *Баланс, Бухгалтарскі ўлік, Інвентарызацыя.* *Н.М.Бандарэнка.*

СПРАВЯДЛІ́ВАСЦЬ, сацыяльна-палітычнае і маральна-прававое паняцце, звязанае з гістарычна зменлівымі ўяўленнямі аб *правах чалавека*; роўныя

магчымасці ўсіх членаў грамадства ў рэалізацыі сваіх здольнасцей і задавальненні жыццёвых патрэбнасцей; адпаведнасць паміж практычнай роляй чалавека ці сац. групы і іх сац. становішчам, паміж правамі і абавязкамі, заслугамі і іх грамадскім прызнаннем, працай і ўзнагароджаннем, злачынствам і пакараннем. У сац.-паліт. сферы ажыццяўленне прынцыпу С. прадугледжвае фактычнае *раўнапраўе грамадзян*, у сферы культуры — у стварэнні спрыяльных умоў для далучэння ўсіх членаў грамадства да духоўных каштоўнасцей. Уяўленні пра С. прайшлі эвалюцыю ад ідэй раўнапраўя у межах саслоўя да ўсеагульнай *роўнасці сацыяльнай*. Пашырэнне спектра С. звязана з рэалізацыяй ідэй *дэмакратыі*, развіццём паліт. культуры і разуменнем чалавечай асобы як найвышэйшай каштоўнасці грамадства.

Першай спробай тэарэт. асэнсавання С. стала сац.-этычнае вучэнне Платона, які лічыў С. сумай усіх дабрачынстваў. Ажыццяўленне прынцыпу С. ў грамадстве ён звязваў з добрасумленным выкананнем сваіх абавязкаў членамі аднаго саслоўя і неўмяшаннем у справы іншага. Арыстоцель вылучаў 2 віды С. (размеркавальную і ўраўняльную) і ўпершыню сфармуляваў прынцып прапарцыянальнасці, згодна з якім размеркаванне дабро т паміж членамі грамадства павінна быць прапарцыянальным іх дзейнасці. У хрысціянстве паняцце С. звязваецца з ідэяй пасмяротнай адплаты за дабрадзейнае ці грэшнае жыццё. Стварэнне сац. ладу, які б вызначаўся С. пры размеркаванні матэрыяльных і духоўных дабро т, выступала асн. ідэяй сацыялістаў-утапістаў (А.Сен-Сімон, Ш.Фур'е, Р.Оўэн). У 20 ст. вызначыліся супрацьлеглыя погляды на праблему С.: адмаўленне магчымасці сац. С. і прызнанне сац. няроўнасці натуральным спосабам існавання грамадства (тэорыя функцыяналізму Э.Дзюркгейма, Э.Мура, тэорыя статусных груп М.Вебера і інш.) і сцвярджэнні, што шляхам мэтазгоднага рэфармавання дзяржавы ці *рэвалюцыі сацыяльнай* магчыма дасягнуць сац. С. (неамаркс ізм, дэмакратычны, этычны, кааператыўны сацыялізм, тэорыя сац. дзяржавы і інш.).

Літ.: Григорьев С.И. Диалог об очень важном: Критич. очерк немарксистских концепций социал. справедливости. Барнаул, 1985; Ермолина Г.К. Идеал справедливости и действительность. Иваново, 1991; Свобода и справедливость: Диалог мировоззрений. Н. Новгород, 1993; Ролз Дж. Теория справедливости: Пер. с англ. Новосибирск, 1995.

І.І.Каталяр.

«СПРАВЯДЛІ́ВАСЦЬ І СВАБО́ДА», гл. *«Джустыцыя эліберта»*.

СПРАЖЭ́ННЕ, 1) змяненне *дзеясловаў* па асобах, часах (гл. *Час дзеяслова*), ладах (гл. *Лад дзеяслова*), *ліках* і *родах* (у прошлым часе і ўмоўным ладзе). 2) Сукупнасць дзеясловаў, якія маюць аднолькавыя асаблівасці словазмянення ў залежнасці ад характару асновы.

У сучаснай бел. мове ў залежнасці ад характару асабовых канчаткаў вылучаюць 2 тыпы С. дзеясловаў — 1-е і 2-е. Яны лёгка вызначаюцца, калі ў асабовых формах націск знаходзіцца на канчатку. Дзеясловы 1-га С. маюць канчаткі «-у(-ю)», «-еш(-эш,-аш)», «-е(-э,-а)» у адз. л., «-ём(-ем, -ом, -ам)», «-еце(-яце, -аце)», «-уць(-юць)» у мн. л. («вяду, вядзеш, вядзе, вядзём, ведзяце, вядуць»; «пяку, пячэш, пячэ, пячом, печаце, пякуць»). Дзеясловы 2-га С. маюць канчаткі «-у(-ю)», «-іш(-ыш)», «-іць(-ыць)» у адз. л., «-ім(-ым)», «-іце(-ыце)», «-аць(-яць)» у мн. л. («стаю, стаіш, стаіць, стаім, стаіце, стаяць»; «маўчу, маўчыш, маўчыць, маўчым, маўчыце, маўчаць»). Тып С. дзеясловаў з ненаціскным канчаткам вызначаюць па інфінітыве. Да 2-га С. адносяць дзеясловы з інфінітывам на «-іць(-ыць)», дзе «-і-», «-ы-» суфіксы (выключэнне складаюць непрадуктыўныя дзеясловы з аднаскладовай асновай: «піць», «біць», «ліць», «віць», «крыць», «мыць», «шыць»), дзеясловы на «-аць(-яць)» тыпу «гнаць», «спаць», «ламаць» і на «-эць(-ець)», калі «-э(-е)» не захоўваюцца ў 1-й асобе адз. л. цяперашняга часу: «гляджу» («гляджу»), «сяджу» («сяджу»), «лячу» («лячу»); выключэнне — дзеясловы «гудзець», «хацець». Дзеяслоў «бегчы» рознаспрагальны: формы 3-й асобы мн. л. цяперашняга (будучага простага часу) утвараюцца па мадэлі 1-га С.: «бягуць», а ўсе астатнія асабовыя формы — па мадэлі 2-га С. («бягу», «бяжыш», «бяжым», «бежыце»). Дзеясловы «есці» і «даць» змяняюцца па стараж. нетэматычным (атэматычным) С.: «елі», «ясі», «есць», «ядзім» («ямо»), «ясце» («ясцё»), «ядуць»; «дам», «дасі», «дасць», «дадзім» («дамо»), «дасце» («дасцё»), «дадуць».

Літ.: Беларуская граматыка. Ч. 1. Мн., 1985; Шуба П.П. Сучасная беларуская мова: Марфаналогія. Марфалогія. Мн., 1987; Сучасная беларуская літаратурная мова: Марфалогія. Мн., 1997.

Т.П.Бандарэнка.

СПРА́ЎНАСЦЬ у тэхніцы, уласцівасць і стан тэхн. вырабу, пры якім яго асноўныя (рабочыя) і другасныя параметры (работаздольнасць дадатковых прыстасаванняў, якія забяспечваюць зручнасць эксплуатацыі, знешні выгляд і інш.) адпавядаюць тэхн. патрабаванням. Спраўны выраб не мае адказаў рэзервовых вузлоў і агрэгатаў. Гл. таксама *Работаздольнасць*.

СПРО́ГІС Іван Якаўлевіч (2.7.1833, хутар Штокмансгоф, Латвія — 1918), гісторык, архівіст. Скончыў рыжскія духоўныя вучылішча і семінарыю (1861), з Пецярбургскай духоўнай акадэміі выключаны ў 1863 за ўдзел у студэнцкіх «беспарадках». Працаваў у Пецярбургскай публічнай б-цы (1863), настаўнікам у Віленскай навуч. акрузе з дарушэннем упарадкаваць кнігі Віленскай публічнай б-кі. З 1865 пам. архіварыуса, у 1879—1915 архіварыус Віленскага цэнтр. архіва стараж. актаў, адначасова ў 1870—1915 чл. *Віленскай археаграфічнай камісіі*. Разам з М.І.*Гарбачэўскім*, П.А.*Гільтэбрантам* і інш. падрыхтаваў шэраг тамоў «Актаў Віленскай археаграфічнай камісіі», склаў паказальнікі да многіх тамоў «Актаў» і да 1—13-га *«Археаграфічнага зборніка дакументаў»*. Распрацаваў навукова-даведачны апарат па дакументах архіва. Пачатая ім праца па складанні вопісу актавых кніг архіва нясконча на.

Тв.: Географический словарь древней Жомойтской земли XVI ст. Вильна, 1888; Виленские архивы... Вильна, 1902.

Літ.: Улащик Н.Н. Очерки по археографии и источниковедению истории Белоруссии феодального периода. М., 1973.

М.Ф.Шумейка.

СПРУЖЫНО́ЎКА, прылада для рыхлення і культывацыі глебы са спружыннымі зубамі на метал. аснове. Наз. таксама спрунжыноўка, пружыноўка.

СПРЫНГС (Springs), горад на ПдУ Паўд.-Афр. Рэспублікі. Засн. ў 1804. Больш за 100 тыс. ж. з прыгарадамі (2000). Трансп. вузел. Цэнтр золатапрамысл. і ураназдабыўнога раёна. Прамысл. спадарожнік г. Іаганесбург. Прам-сць: маш.-буд. (вытв-сць горна-шахтавага і электрычнага абсталявання), металаапр., шкляная. У наваколлі здабыча каменнага вугалю.

СПРЫНДЖЎК Уладзімір Генадзевіч (22.7.1936, Мінск — 26.7.1987), бел. матэматык. Акад. АН Беларусі (1986; чл.-кар. 1969), д-р фіз.-матэм. н. (1966), праф. (1969). Скончыў БДУ (1959). З 1962 у Ін-це матэматыкі АН Беларусі (з 1969 заг. лабараторыі), адначасова ў 1965—70 у БДУ. Навук. працы па тэо-



Спружыноўка.

рыі лікаў. Вырашыў *Малера праблему*, распрацаваў метрычную тэорыю дыяфантавых набліжэнняў залежных велічынь, тэорыю эфектыўных межаў рашэнняў дыяфантавых ураўненняў, устанавіў параметрычныя ўласцівасці палёў алг. лікаў з вял. колькасцю класаў ідэалаў. Вырашыў праблемы эфектызацыі тэарэмы Гільберта пра непрыводнасць і вызначэння абелевых пунктаў на алг. крывых.

Тв.: Проблема Малера в метрической теории чисел. Мн., 1967; Метрическая теория диофантовых приближений. М., 1977; Теорема Гильберта о неприводимости и рациональные точки на алгебраических кривых // Докл. АН СССР. 1979. Т. 247, № 2.

Літ.: В.Г.Спринджук: Библиогр. указ. Мн., 1989.

СПРЫ́НТЭР (англ. sprinter ад sprint бег на кароткія дыстанцыі), спартсмен, які спецыялізуецца на пераадоленні кароткіх дыстанцый у лёгкаатлетычным бегу, плаванні, веласіпедным, канькабежным спорце і інш.

СПРЫНЧА́Н Браніслаў Пятровіч (н. 16.8.1928, с. Каніж Навамірградскага р-на Кіраваградскай вобл., Украіна),



У.Г.**Спрынджук**.



Б.П.**Спрынчан**.

бел. паэт, перакладчык. Скончыў Літ. ін-т імя М.Горкага ў Маскве (1959), Мінскую ВПШ (1966). З 1949 працаваў майстрам кавальскага цэха, з 1955 у шматтыражнай газеце на з-дзе «Гомсельмаш». У 1962—64 у газ. «Советская Белоруссия», у 1966—91 заг. аддзела паэзіі час. «Нёман». Друкуецца з 1949. Піша на рус. мове. Першая кніга паэзіі — «Над кручамі Сажа» (1957). У паэт. кн. «У цэнтральным пралёце» (1961), «Вецер на адхонах» (1964), «Плаўка» (1968), «Рысы твару» (1970), «Ясень» (1973), «Быстрыня» (1982), «Надзеі пяшчотныя парасткі» (1986), «Жыцця вечныя кругі» (1990), «Смутны дзень» (1994) і інш. паэтызацыя чалавека-працаўніка, любоў да роднай зямлі, апяванне прыгажосці прыроды, усведамленне грамадз. адказнасці за лёс планеты, тэмы кахання і вернасці. На рус. мову пераклаў зб-кі вершаў П.Макаля «Дотык да зямлі» (1977) і М.Багдановіча «Вянок» (1985, 2-е выд. 1991), асобныя вершы Р.Барадуліна, П.Броўкі, Г.Бураўкіна, А.Вярцінскага, А.Гаруна, Н.Гілевіча, А.Звонака, В.Зуёнка, К.Кірэенкі, А.Коршака, К.Крапівы, П.Панчанкі, А.Пысіна, М.Танка, П.Труса, Я.Янішчыц і інш., паэму «Матулям з Расон» М.Нагнібеды.

Тв.: Вечная страда: Избр. стихи и переводы. Мн., 1978; Свет любви: Избр. 1988; Васильки на белом полотне. Мн., 1990; Вербная неделя. Мн., 2002. *І.У.Саламевіч.*

СПРЫНЧА́Н Вадзім Браніслававіч (н. 14.1.1950, г. Гомель), бел. паэт, перакладчык. Сын Б.П.*Спрынчана*. Скончыў БДУ (1972). У 1972—89 у выд-ве «Мастацкая літаратура» (з 1982 заг. рэдакцыі паэзіі). Друкуецца з 1976. Піша на рус. мове. У паэт. зб-ках «Зямля і зоры» (1981), «Святло непадзельнае» (1991) філас. роздум пра чалавека, прыроду, трывога за лёс свету, тэма кахання. Вершы 1990-х г. вызначаюцца ўзмацненнем хрысц. матываў. Складальнік кніг вершаў бел. паэтаў «Адданасць» (1978), «Дзень паэзіі, 1965—1984» (1986, з Я.Міклашэўскім), кніг твораў М.Лермантава «Зорка зорцы голас падае» (1989), А.Пушкіна (т. 1—2, 1990) і інш. Пераклаў на рус. мову асобныя вершы Я.Коласа, Р.Барадуліна, А.Канапелькі, М.Мятліцкага, Г.Пашкова, А.Пысіна, М.Стральцова, Я.Янішчыц і інш.

І.У.Саламевіч.

СПРЭД (ад англ. spread расцягваць, расшыраць), 1) адначасовыя купля і продаж ф'ючэрсных кантрактаў на адзін і той жа тавар з рознымі тэрмінамі пастаўкі або на два розныя, але ўзаемазвязаныя тавары. 2) Адначасовая купля і продаж ф'ючэрсных кантрактаў з неўзаемазвязанымі таварамі з мэтай зніжэння спаганяемых падаткаў — падатковы спрэд. 3) Адначасовая купля і продаж апцыёнаў аднаго тыпу, але па розных базісных цэнах ці з розным перыядам да моманту сканчэння апцыёну або па розных базісных цэнах і з розным перыядам. 4) Розніца паміж цэнамі, курсамі, стаўкамі.

СПРЭ́ДЗІНГ (англ. spreading ад spread расцягваць, расшыраць), працэс рассоўвання пліт цвёрдай *літасферы* ў вобласці рыфтаў сярэдзінна-акіянічных хрыбтоў (паводле гіпотэзы новай глабальнай тэктонікі). Адбываецца з аднаўленнем зямной кары акіянічнага тыпу за кошт матэрыялу, які ўздымаецца з верхняй мантыі, разагрэтай узыходнымі канвекцыйнымі патокамі. Гл. *Тэктанічныя гіпотэзы*.

СПРЭ́ЧКІ СУДО́ВЫЯ, частка судовага разбору, што наступае пасля заканчэння судовага *следства*. У іх бяруць удзел суб'екты крымін. працэсу для падвядзення вынікаў разгляду справы. У сваіх прамовах яны аналізуюць даследаваныя ў пасяджэнні доказы і выказваюць *суду* свае меркаванні адносна акалічнасцей справы, віны *абвінавачанага*, юрыд. кваліфікацыі яго дзеянняў і якой меры пакарання, на думку ўдзельніка С.с., заслугоўвае абвінавачаны, калі суд знойдзе падставы для яго асуджэння. У С.с. удзельнічаюць: дзярж. і прыватныя абвінаваўцы, пацярпелыя, грамадзянскія істцы і адказчыкі або іх прадстаўнікі, абаронца. Першым выступае абвінаваўца. Паслядоўнасць выступленняў інш. удзельнікаў С.с. устанаўлівае суд. Парадак С.с. рэгламентуецца працэсуальным заканадаўствам.

СПУСКА́ЛЬНЫ АПАРА́Т, *касмічны апарат* ці яго частка для спуску і мяккай пасадкі на паверхню Зямлі ці інш. нябеснага цела. На пілатуемых касм. апаратах С.а. — герметычная кабіна, у якой знаходзіцца экіпаж, на аўтам. (беспілотных) — капсула з прыборамі. Спускаецца з тармажэннем па балістычнай траекторыі ці па траекторыі планіруючага спуску.

Мае сістэмы прызямлення, кіравання рухам, тэрмарэгулявання, радыёсувязі; С.а. пілатуемых караблёў — дадаткова крэслы і пульты касманаўтаў, сістэму жыццезабеспячэння, перагаворныя і тэлевізійныя ўстройствы і інш. Корпус вырабляецца з метал. сплаву, мае герметычныя люкі (для выхаду экіпажа, парашутнай сістэмы і інш.); трываласць павышаецца за кошт выкарыстання скідвальнага перад пасадкай цеплаахоўнага экрана і сотавых элементаў днішча, якія дэфармуюцца пры пасадцы. С.а. мае сферычную ці конусападобную форму; апошняя забяспечвае планіруючы спуск, што дае магчымасць знізіць перагрузкі, правесці кіравальны спуск і інш. (С.а. касм. караблёў *«Саюз»*, *«Апалон»* і інш.). *У.С.Ларыёнаў.*

СПУША́НКА, рака ў Шчучынскім і Гродзенскім р-нах Гродзенскай вобл., правы прыток р. Скідзелька (бас. р. Нёман). Даўж. 44 км. Пл. вадазбору 228 км^2. Пачынаецца каля в. Плянты Шчучынскага р-на, упадае ў р. Скідзелька на ўсх. ускраіне г. Скідзель. Даліна звілістая, трапецападобная, шыр. 0,6—1,8 км. Пойма да в. Дамброва Шчучынскага р-на двухбаковая, месцамі чаргуецца па берагах, забалочаная, ніжэй па цячэнні вузкая, адкрытая. Рэчышча звілістае, шыр. 5—7 м, на працягу 18 км каналізаванае. Прымае сцёк з меліярац. каналаў.

СПЯРА́НСКІ Аляксей Дзмітрыевіч (11.1.1888, г. Уржум Кіраўскай вобл., Расія — 23.7.1961), расійскі вучоны ў галіне паталаг. фізіялогіі. Акад. АН СССР (1939) і АМН СССР (1944). Скончыў Казанскі ун-т (1911). З 1923 асістэнт І.П.*Паўлава*. З 1928 у Ленінградскім ін-це эксперымент. медыцыны, з 1934 ва Усесаюзным ін-це эксперым. медыцыны ў Маскве, з 1945 у Ін-це нармальнай і паталаг. фізіялогіі АМН СССР (у 1945—54 дырэктар). Навук. працы па пытаннях трафічнай функцыі нерв. сістэмы ў паталаг. працэсах. Распрацоўваў праблемы этыялогіі працэсаў запалення, інфекцыі, імунітэту, пухлінага росту, рэактыўнасці арганізма. Дзярж. прэмія СССР 1943.

Тв.: Нервная система в патологии. М.; Л., 1930; Элементы построения теории медицины. М.; Л., 1935; Избр. труды. М., 1955.

Літ.: А.Д.Сперанский // Патологическая физиология и экспериментальная терапия. 1961. Т. 5, №6.

СПЯРА́НСКІ Міхаіл Міхайлавіч (1.1.1772, с. Чаркуціна Уладзімірскай вобл., Расія — 11.2.1839), расійскі дзярж. і грамадскі дзеяч, правазнавец, філосаф. Скончыў Пецярбургскую духоўную се-

мінарыю (1791). З 1797 на дзярж. службе. У 1803—07 дырэктар дэпартамента Мін-ва ўнутр. спраў. З 1807 статс-сакратар імператара Аляксандра I, з 1808 чл. Камісіі па складанні законаў, пам. міністра юстыцыі. У 1809 распрацаваў «Уводзіны да збору дзяржаўных законаў», дзе прапанаваў надаць самадзяржаўю выгляд «ісціннай» манархіі, г.зн. канстытуцыйнай, каб пазбегнуць рэв. катастроф. Яго заканад. ініцыятывы, у прыватнасці ідэя выбарнасці дзярж. ор-



А.Дз.**Спяранскі**.



М.М.**Спяранскі**.

ганаў, выклікалі рэзкую апазіцыю з боку кансерватыўнай часткі дваранства. У 1812 адхілены ад дзярж. службы і высланы ў Ніжні Ноўгарад, Перм. З 1816 пензенскі губернатар, з 1819 — ген.-губернатар Сібіры. У 1821 вернуты ў сталіцу. Узначальваў Камісію па складанні законаў, быў чл. Дзярж. савета, чл. Вярх. крымін. суда па справе дзекабрыстаў. Працаваў над кадыфікацыяй законаў і кіраваў выданнем «*Поўнага збору законаў Расійскай імперыі*» і «Зводу законаў», распрацоўваў праекты ў галіне фін.-бюджэтнай і эканам. палітыкі дзяржавы. На фарміраванне і эвалюцыю яго ідэй у філасофіі дзяржаўнасці, палітыкі, права, рэлігіі паўплывалі ідэалогія Франц. рэвалюцыі, вучэнне франц. асветнікаў і ням. містыкі і патрыстыкі. У аснове яго праектаў і планаў дзярж. пераўтварэнняў ідэя аб тым, што гал. мэтай прагрэсу з'яўляецца паліт. свабода, а лад праўлення вызначаецца ўзроўнем грамадскага развіцця. Выказваўся за адмену прыгоннага права, падтрымліваў прынцып падзелу ўлад на заканадаўчую, выканаўчую і судовую. Падзяляў думку аб несапраўднасці царк. хрысціянства і верыў у «панадцаркоўную хрысціянізацыю» грамадскага жыцця, што паслужыла пачаткам філасофіі сац. хрысціянства. У сувязі са зменай раскладу паліт. сіл у Расіі С. не змог рэалізаваць свае планы рэфармавання дзяржавы і стварэння механізма яе ўзаемадзеяння з грамадствам на аснове закона і права.

Тв.: У кн.: В память графа М.М.Сперанского, 1772—1872. СПб., 1872; План государственного преобразования: (Введение к Уложению гос. законов). М., 1905; Проекты и записки. М.; Л., 1961.

Літ.: Чибиряев С.А. Великий реформатор: Жизнь, деятельность, полит. взгляды М.М.Сперанского. М., 1989; Томсинов В.А. Светило российской бюрократии. М., 1991. *В.І.Боўш.*

СПЯРА́НСКІ Сяргей Барысавіч (23.5.1914, Казань, Татарстан — 13.3.1983), расійскі архітэктар. Нар. архітэктар СССР (1971). Правадз. чл. АМ СССР (1979). Скончыў Ленінградскую АМ (1941), з 1947 выкладаў у ёй. Асн. работы (у аўтарскім калектыве): жылыя дамы на Маскоўскім (1956—61) і Новаізмайлаўскім (1964—65) праспектах, тэлецэнтр (1962), Ін-т дызельнай прам-сці (1963), гасцініцы «Ленінград» (1970) і «Пулкава» (1981) — усе ў С.-Пецярбургу; комплекс збудаванняў мытні на рас.-фінл. граніцы (1967). Дзярж. прэмія СССР 1973, Ленінская прэмія 1978.

СПЯРА́НТАВА Валянціна Аляксандраўна (24.2.1904, г. Зарайск Маскоўскай вобл. — 7.1.1978), расійская актрыса. Нар. арт. СССР (1970). Скончыла Тэатр. тэхнікум імя А.Луначарскага (1925). З 1925 у 1-м Дзярж. пед. т-ры, з 1944 у Цэнтр. дзіцячым т-ры ў Маскве. Іграла ролі падлеткаў: Ягорка («Чорны яр» А.Афінагенава), Герда і Кей («Снежная каралева» Я.Шварца) і інш. З сярэдзіны 1950-х г. перайшла на характарныя ролі: Кукушкіна («Даходнае месца» А.Астроўскага), Клаўдзія Васілеўна («У пошуках радасці» В.Розава), Бабуля («Зваротны адрас» А.Алексіна) і інш. Здымалася ў кіно: «Шумны дзень», «Апошні месяц восені», «Дабрыня». Выступала на радыё і тэлебачанні. Дзярж. прэмія Расіі 1974.

СПЯСІ́ЎЦАВА Вольга Аляксандраўна (18.7.1895, г. Растоў-на-Доне, Расія — 16.9.1991), артыстка балета. Скончыла Пецярбургскае тэатр. вучылішча (1913). У 1913—23 у Марыінскім т-ры, удзельнічала ў спектаклях Рус. балета Дзягілева за мяжой (1916, 1921, 1927). З 1924 выступала ў т-ры «Гранд-апера» ў Парыжы, у 1932—37 гастраліравала з трупамі М.Фокіна, В.Дандрэ (б. трупа Г.Паўлавай). З 1939 у ЗША. Балерына лірыка-рамант. і трагедыйнага плана. Яе танец вылучаўся дакладнасцю графічных поз, дасканаласцю. Сярод партый: Жызэль («Жызэль» А.Адана), Аўрора («Спячая прыгажуня» П.Чайкоўскага), Эсмеральда («Эсмеральда» Ц.Пуні), Нікія («Баядэрка» Л.Мінкуса).

СПЯ́ЧКА, фізіялагічны стан паніжанай жыццядзейнасці *гамаятэрмных жывёл* (цеплакроўныя) у неспрыяльныя сезоны года; форма прыстасавання да сезонных умоў існавання. Назіраецца пераважна ў дробных млекакормячых умераных і высокіх шырот. Адрозніваюць С.: зімовую (гібернацыя), летнюю (эстывацыя), сутачную і нерэгулярную.

Перад С. жывёлы назапашваюць у арганізме рэзервовыя рэчывы, пераважна тлушчы (да 30—40% масы цела), хаваюцца ў сховішчах са спрыяльным мікракліматам (норы, гнёзды, дуплы, расколіны скал і інш.). У час С. значна зніжаецца абмен рэчываў, тармозяцца нерв. рэакцыі («глыбокі сон»), запавольваецца дыханне, паніжаецца т-ра цела, сэрцабіцце, мяняецца хім. састаў крыві і інш., жывёлы не рухаюцца і не кормяцца. Працягласць С. ў некат. жывёл да 8,5 мес. У стане С. жывёлы існуюць за кошт павольнага выкарыстання энергет. рэзерваў арганізма, пераважна тлушчу. У зімовую С. ўпадаюць кажаны, вожыкі, суркі, суслікі, тушканчыкі, соні, стэпавыя чарапахі; у летнюю — жывёлы саваннаў, паўпустынь і пустынь; у сутачную — некат. кажаны, калібры і інш.; у нерэгулярную С. — вавёркі, янотападобны сабака, стрыжы, ластаўкі і інш. Некат. млекакормячыя (мядзведзь, янот, барсук і інш.) упадаюць у *зімовы сон*. Для *пайкілатэрмных жывёл* (халаднакроўныя — беспазваночныя, рыбы, амфібіі, рэптыліі) С. адпавядае здранцвенне (праяўленне *анабіёзу*), якое адрозніваецца ад С. менш дасканалымі механізмамі фізіял. кантролю.

Літ.: Калабухов Н.И. Спячка млекопитающих. М., 1985. *Л.В.Кірыленка.*

СРАЗНЕ́ЎСКІ Ізмаіл Іванавіч (13.6.1812, г. Яраслаўль, Расія — 21.2.1880), рускі філолаг-славіст.- Акад. Пецярб. АН (1851). Скончыў Харкаўскі ун-т (1829), дзе працаваў (з 1842 праф.). Выкладаў у пецярбургскіх ун-це (з 1847 праф.) і пед. ін-це (1848—59). У 1839—42 падарожнічаў на землях зах. і паўд. славян, вывучаў нар. мову і фальклор. Асн. працы па гісторыі рус. мовы, дыялекталогіі, па помнікі стараж. славян. і рус. пісьменства, па палеаграфіі, археалогіі, бібліяграфіі, гісторыі стараж.-рус. л-ры і інш. Вывучаў паэзію і побыт слав. народаў. Заснавальнік школы пецярб. славістаў. Аўтар працы «Матэрыялы для слоўніка старажытнарускай мовы паводле пісьмовых помнікаў» (т. 1—3, 1893—1912, 2-е выд., 1958), у якой шмат матэрыялаў з бел. пісьмовых помнікаў.

Тв.: Славяно-русская палеография XI—XIV вв. СПб., 1885; Русское слово: Избр. тр. М., 1986.

Літ.: Смирнов С.В. И.И.Срезневский (1812—1880) // Рус. речь. 1972. №6.

СРО́ДКАЎ АЎТАМАТЫЗА́ЦЫІ НДІ Міністэрства прамысловасці Рэспублікі Беларусь. Засн. ў 1969 у Мінску як філіял НДІ аўтам. апаратуры (Масква). З 1972 НДІ сродкаў аўтаматызацыі. З 2001 навукова-даследчае рэсп. унітарнае прадпрыемства «НДІ сродкаў аўтаматызацыі». Ін-т — адзін з лідэраў сусв. практыкі ў стварэнні аўтаматызаваных сістэм кіравання (АСК), сістэм сувязі і перадачы даных ваен. прызначэння. Асн. кірункі дзейнасці: распрацоўка АСК паветраным і дарожным рухам, сартавальнымі станцыямі, лясной гаспадаркай, хім. вытв-сцю, энергетыкай; распрацоўка інфарм. і інфармацыйна-даведачных сістэм мін-ваў і ведамстваў, чыг. вакзалаў, а таксама стадыёнаў, палацаў спорту і інш. відовішчных збудаванняў.

М.І.Азаматаў.

СРО́ДКІ ВЫТВО́РЧАСЦІ, сукупнасць прадметаў і сродкаў працы, якія выкарыстоўваюцца ў працэсе вытв-сці матэрыяльных даброт. Прадметы працы — усё, што апрацоўваецца і на што накіравана праца чалавека. Да іх належаць прадметы, дадзеныя непасрэдна прыродай (руда, нафта, вугаль, што здабываюцца з нетраў зямлі), а

таксама сыравіна — часткова апрацаваныя прадметы (кокс, бавоўна, піламатэрыялы). Сродкі працы — рэчы, прылады, з дапамогай якіх чалавек апрацоўвае прадметы працы. Да іх належаць прылады працы (абсталяванне, машыны, прыборы, станкі), вытв. будынкі і збудаванні, дарогі, трубаправоды, каналы, сродкі перавозкі грузаў (таварныя вагоны, платформы і інш.), ёмістасці для захоўвання прадметаў працы (цыстэрны, бочкі, балоны) і інш. С.в. ствараюць рэчыўны фактар вытв-сці, з'яўляюцца састаўной часткай *прадукцыйных сіл* грамадства. Пад уплывам пануючых вытв. адносін С.в. ў розных *фармацыях грамадска-эканамічных* выступаюць у розных формах (напр., *абаротныя фонды, асноўныя вытворчыя фонды*).

М.В.Радзіеўскі.

СРО́ДКІ ПРА́ЦЫ, гл. ў арт. *Сродкі вытворчасці*.

СРУО́ГА (Sruoga) Баліс (2.2.1896, в. Байбокай Панявежскага пав., Літва — 16.10.1947), літоўскі пісьменнік. Д-р філас. н. (1924). Вучыўся ў Маскоўскім ун-це (1916—18), скончыў Мюнхенскі ун-т (1924). У 1924—40 выкладаў у Каўнаскім (з 1932 праф.), у 1940—43 і з 1945 у Вільнюскім ун-тах. У 1943—45 вязень канцлагера ў Штутгофе. Друкаваўся з 1911. У зб-ках паэзіі «Сонца і пясок» (1920), «Сцежкамі багоў» (1923) сімвалісцкія матывы адзіноты, кахання, прыроды. У гіст. драмах «У цені волата» (1932), «Страшная ноч» (1935), «Доля перадсвітальная» (1945), «Казімір Сапега» (1947) і інш. праблемы дзяржаўнасці Літвы, патрыят. абавязку; у гуманіст. плане паказана сувязь асобы з гісторыяй народа; сцэнічная канфліктнасць спалучаецца з псіхалагізмам і паэтычнасцю вобразаў герояў. Аўтар кн. мемуараў пра Штутгоф «Лес багоў» (1945), прац па фальклярыстыцы, гісторыі л-ры і тэатра. Перакладаў творы рус. і інш. аўтараў. На бел. мову яго асобныя вершы пераклаў А.Вольскі.

Тв.: Рус. пер. — В тени исполина: Драмы. Вильнюс, 1968.

А.П.Лапінскене.

СРЫНА́ГАР, горад на Пн Індыі, у Гімалаях (на выш. каля 1600 м), на р. Джэлам (бас. р. Інд). Адм. ц. штата Джаму і Кашмір. Каля 1 млн. ж. з прыгарадамі (2000). Вузел аўтадарог, рачная прыстань, аэрапорт. Прам-сць: тэкст. (шоўкамятальныя, шаўкаткацкія і шэрсцяткацкія прадпрыемствы), дрэваапр., машынабудаўнічая. Цэнтр саматужных промыслаў: выраб кашміравых хустак, дываноў, шаўковых тканін, сярэбраных упрыгожанняў, ювелірных вырабаў, разьба па дрэве. 2 ун-ты. Музей. Тэр. С. перарэзана каналамі, унутрыгарадскія зносіны пераважна на лодках («азіяцкая Венецыя»). Мячэці 15—16 ст., стараж. культавыя і жылыя драўляныя пабудовы. Турызм, база гімалайскіх экспедыцый.

СРЭ́БРА, тое, што *серабро*.

СРЭ́БРАНІК, умоўная назва сярэбранай манеты часоў Кіеўскай Русі з імёнамі князёў *Уладзіміра Святаславіча, Святаполка Яраполчыча* і *Яраслава Мудрага*; як і *златнік*, першая манета ўсх. славян. Вядомы 4 тыпы С. Уладзіміра, 3 — Святаполка, 1 — Яраслава. Маса большасці манет 2,4—3,3 г, дыяметр 25—32 мм, проба ад высокай да слядоў серабра ў медзі. Захавалася больш за 260 экз., большасць з нежынскага 1852 і кіеўскага 1860 скарбаў, на Беларусі выяўлены ў Быхаўскім (4 экз.) і Талачынскім (фрагмент манеты) р-нах.



Срэбранік Яраслава Мудрага. 1014—15.

СС (ням. SS, скарачэнне ад Schutzstaffeln ахоўныя атрады), прывілеяваная ваенізаваная арг-цыя *Нацыянал-сацыялісцкай партыі*, асн. інструмент яе тэрарыст. палітыкі; адна з гал. апор нацысцкага рэжыму ў Германіі. Папярэднікамі СС былі чл. *штурмавых атрадаў* (СА), сфарміраваных у маі 1923 як «эскорт фюрэра» (пазней «штурмавая група Гітлера»). Уласна СС створана ў ліст. 1925 і ў 1926 падпарадкавана кіраўніцтву легалізаваных СА. З 1929 кіраўніком (рэйхсфюрэрам) СС быў Г.*Гімлер*. Колькасць членаў СС з 280 чал. у 1929 да моманту прыходу нацыстаў да ўлады (студз. 1933) павялічылася да 52 тыс. чал. Разам з СА ахоўныя атрады ўдзельнічалі ў пагромах антыфаш. арг-цый Германіі і інш. Самаст. арг-цыяй СС сталі пасля расправы гітлераўцаў (у ноч на 30.6.1934) з апазіц. лідэрамі СА. У 1934 з агульнага складу СС вылучаны часці «Мёртвая галава» і часці спец. прызначэння, якія ў 1939 перайменаваны ў войскі СС. У 2-ю сусв. вайну колькасць войск СС вырасла з 4 палкоў (18 тыс. чал.) у 1939 да 38 дывізій, у т.л. 8 танк. і 8 матарызаваных (каля 950 тыс. чал.) у снеж. 1944. Састаўной часткай СС была «служба бяспекі» — СД. У 1939 у выніку аб'яднання *гестапа* і СД у сістэме СС створана Гал. імперскае ўпраўленне бяспекі (РСХА). У 1943 рэйхсфюрэр СС, які стаў міністрам унутр. спраў, сканцэнтраваў усю паўнату ўлады над фарміраваннямі карнага апарату ў Германіі і на акупіраваных тэрыторыях. Службы і фарміраванні СС выконвалі карныя функцыі з выключнай жорсткасцю і фанатызмам. На акупіраванай тэр. Беларусі палітыку *генацыду* і «*выпаленай зямлі*» СС ажыццяўляла сіламі 1-й матарызаванай і 1-й кав. брыгад (усяго 9390 чал., 1941). З асабовага складу часцей СС і СД, а таксама з па-антысавецку настроеных элементаў і крымінальнікаў фарміраваліся мабільныя групы і каманды (у т.л. батальён О.Дырлевангера) для знішчэння ваеннапалонных, насельніцтва, для рабавання і вывазу захопленай маёмасці. СС былі падпарадкаваны 5 асобных паліцэйскіх палкоў і 19 батальёнаў, жандармерыя і інш. Кіраўнікамі СС і паліцыі ў ген. акрузе Беларусь былі брыгадэнфюрэры К.Цэнер, К. фон *Готберг*, а таксама вышэйшы кіраўнік СС і паліцыі Расіі «Цэнтр» обергрупенфюрэр Э. фон дэм Бах-Зелеўскі. Пад іх кіраўніцтвам войскі СС разам з часцямі і падраздзяленнямі вермахта і паліцыі правялі вял. колькасць карных аперацый і акцый, знішчылі сотні тысяч жыхароў акупіраваных тэр. і палонных ваеннаслужачых. У 1945 СС абвешчана па-за законам, паводле прыгавору Міжнар. ваен. трыбунала 1946 (гл. *Нюрнбергскі працэс*) прызнана злачыннай арг-цыяй герм. фашызму.

Літ.: СС Адольфа Гитлера: Пер с англ. М., 1997; Уильямсон Г. СС — инструмент террора: Пер. с англ. Смоленск, 1999; СС в действии: Док. о преступлениях СС: Пер. с нем. М., 2000.

ССЕ́ЧАНАЯ ПІРАМІ́ДА, геаметрычнае цела, што адсечана ад піраміды плоскасцю, паралельнай аснове. Аб'ём С.п. роўны $V = \frac{1}{3} h\,(S_1 + S_2 + \sqrt{S_1 S_2})$, дзе h — вышыня С.п., S_1 і S_2 — плошчы яе асноў. Іл. гл. да арт. *Піраміда*.

ССЕ́ЧАНАЯ ПРЫ́ЗМА, геаметрычнае цела, якое адсякаецца ад *прызмы* плоскасцю, не паралельнай аснове. Аб'ём С.п. роўны $V = lQ$, дзе l — даўжыня адрэзка, які злучае цэнтры асноў, Q — плошча сячэння прызмы плоскасцю, перпендыкулярнай да гэтага адрэзка.

ССЕ́ЧАНЫ КО́НУС, геаметрычнае цела, што адсечана ад *конуса* плоскасцю, паралельнай аснове. Аб'ём С.к. роўны



Ссечаная прызма.



Ссечаны конус.



Ссечаны цыліндр.

$V = {}^1/_3\pi\, h\,(r_1^2 + r_2^2 + r_1 r_2)$, дзе r_1, r_2 — *радыусы асноў*, h — вышыня.

ССЕ́ЧАНЫ ЦЫЛІ́НДР, геаметрычнае цела, якое адсякаецца ад *цыліндра* плоскасцю, не паралельнай аснове. Аб'ём круглага С.ц. роўны $V = \pi r^2 \frac{h_1 + h_2}{2}$, дзе h_1 і h_2 — найбольшы і найменшы адрэзкі ўтваральнай цыліндра, r — радыус асновы цыліндра.

ССЫ́ЛКА, від крымінальнага пакарання, які заключаецца ў выдаленні асуджанага з месца яго жыхарства з абавязковым пасяленнем у пэўнай мясцовасці.

У еўрап. дзяржавах С. ўведзена яшчэ ў 15—16 ст. З Вялікабрытаніі злачынцаў ссылалі ў Амерыку (да 1776) і Аўстралію (да 1852), з Францыі ў Франц. Гвіяну і Новую Каледонію, з Партугаліі ў афр. калоніі, з Грэцыі — на астравы Эгейскага мора (у перыяд ваен. дыктатуры 1967—74), што служыла таксама мэтам засялення новых тэрыторый.

У Расіі С. (пераважна С. палітычная) склалася ў 16—17 ст., найб. пашырэнне набыла ў 19 — пач. 20 ст. Ссылалі паводле прыгавору суда або ў адм. парадку. Месцам С. служылі аддаленыя ад сталіц і прамысл. цэнтраў мясцовасці еўрап. ч. Расіі, Поўначы, Сібіры, Д. Усходу або Сярэдняй Азіі. Сярод паліт. ссыльных былі дзеячы *расколу*, праціўнікі рэформ *Пятра I*, ахвяры дварцовых пераваротаў 18 ст., удзельнікі *Барскай канфедэрацыі*, паўстанняў 1794, 1830—31, 1863—64 у Польшчы, Беларусі і Літве, *дзекабрысты*, народнікі, сацыял-дэмакраты і інш. С. скасавана ў Расіі пасля Лют. рэвалюцыі 1917, адноўлена *бальшавікамі* ў першыя гады сав. улады. Крымін. кодэкс (КК) РСФСР (1926) прадугледжваў С., на тэрмін ад 2 да 10 гадоў у якасці самаст. і да 5 гадоў дадатковай меры пакарання. У 1931 уведзена дадатковая С. пасля адбыцця тэрміну зняволення для асуджаных за шэраг «контррэвалюцыйных» злачынстваў, бандытызм і інш. З сярэдзіны 1930-х г. Асобая нарада НКУС СССР сістэматычна накіроўвала ў С. (спачатку на 5, потым на 10, 25 гадоў) пасля адбыцця зняволення тых з вышэйназваных, у каго ў судовым прыгаворы не было С. З 1948 гэтая дадатковая С. стала пажыццёвай. КК СССР (1960) замест гэтых дадатковых рашэнняў прадпісваў судам назначаць у прыгаворах за адпаведныя злачынствы як тэрмін пазбаўлення волі, так і наступную С. З 1920-х г. акрамя пакарання за канкрэтныя злачынствы практыкавалася масавая С. былых паліт. праціўнікаў бальшавікоў (*меншавікі*, эсэры, кадэты, анархісты і інш.), да якіх у 1927 далучаны і трацкісты. Формай С. былі *дэпартацыі* 1930—40-х г., у т.л. звязаныя з *калектывізацыяй*. С. як асобны від пакарання захоўвалася ў сав. праве да 1992. На Беларусі выкарыстоўвалася паводле рашэння суда або ў адм. парадку, гал. чынам у адносінах асоб, якія абвінавачваліся ў паліт. злачынствах. Існавала ў 1928—94. Не ўжывалася да непаўналетніх, цяжарных жанчын і жанчын, якія мелі на ўтрыманні дзяцей да 8-гадовага ўзросту. *І.М.Кузняцоў.*

СТАБІЛІЗА́ТАР (ад лац. stabilis устойлівы, пастаянны) у тэхніцы, 1) устройства для аўтам. падтрымання зададзенага значэння рэгулюемай велічыні з пэўнай дакладнасцю пры зменных узбуральных уздзеяннях. Бываюць С. эл. току і напружання, магн. патоку, т-ры, вуглавой скорасці і інш.

Найб. пашыраны электрычныя С., якія паводле спосабу стабілізацыі падзяляюцца на параметрычныя, кампенсацыйныя і камбінаваныя; па рэжыме работы — на С. неперарыўнага дзеяння і дыскрэтныя (рэлейныя і імпульсныя); паводле тыпу сілавых прылад (стабілізуючых элементаў) — на электронныя (паўправадніковыя, мікраэлектронныя, вакуумныя, газаразрадныя) і феромагнітныя, у т.л. ферарэзанансныя.

2) Частка гарыз. *апярэння* самалёта і інш. лятальных апаратаў. Нерухомыя С. прызначаны для забеспячэння падоўжнай устойлівасці, рухомыя (цалкам кіравальны, дыскрэтна-перастаўны, трымеруемы, дыферэнцыяльны) служаць, акрамя таго, для забеспячэння балансіроўкі і ажыццяўлення манеўраў. 3) С. у фатаграфіі — рэчыва, якое ўводзіцца ў галагенасярэбраную эмульсію для папярэджання ўтварэння вуалі і для запавольвання старэння фотаматэрыялаў.

СТАБІЛІЗА́ТАРЫ палімераў, рэчывы, якія зніжаюць скорасці хім. працэсаў, што прыводзяць да *старэння палімераў*. Паводле прыроды агрэсіўных агентаў (кісларод, азон і інш.) ці фіз.-хім. фактараў (святло, іанізавальнае выпрамяненне і інш.), уздзеяннем якіх абумоўлена старэнне палімераў і палімерных матэрыялаў, С. наз. *антыаксідантамі*, *антыазанантамі*, святлостабілізатарамі (*фотастабілізатарамі*), *антырадамі* і г.д. С. ўводзяць у палімеры на стадыі іх сінтэзу, перапрацоўкі ці ў гатовыя вырабы (наносяць на паверхню вырабу з раствору). Выкарыстанне С. запавольвае старэнне палімераў у 2—3 разы, а ў некаторых выпадках у сотні і тысячы разоў; часта для *стабілізацыі палімераў* выкарыстоўваюць камбінацыі некалькіх С. розных тыпаў, што больш эфектыўна ахоўвае палімер ад старэння, чым кожны са С. паасобку (гл. *Сінергізм*).

СТАБІЛІЗА́ЦЫЯ ЧАСТАТЫ́ ў радыётэхніцы, падтрыманне пастаянства частаты эл. ваганняў аўтагенератара (гл. *Генератар* у радыётэхніцы).

Меры С.ч. накіраваны на павышэнне ўстойлівасці частаты генератара ў адносінах да дэстабілізаваных фактараў (змен т-ры, вільготнасці, атм. ціску, сілкавальных напружанняў, старэння дэталей і інш.). Такое павышэнне дасягаецца павелічэннем *дыхтоўгальнай энергіяй* паміж узбуджанымі малекуламі ў газавай фазе з малекуламі пабочных газаў пры іх сутыкненнях з захаваннем электроннай энергіі ўзбуджэння. Выяўляецца па зменах эфектыўнасці, працягласці, а таксама спектраў флуарэсцэнцыі малекул. Адкрыта М.А.*Барысевічам* і рас. фізікам Б.С. Непарэнтам (1955). Адкрыццё С.-л.з. садзейнічала стварэнню *лазераў* на пары арган. злучэнняў. Выкарыстоўваецца ў спектраскапіі, люмінесцэнцыі, фотахіміі, лазернай фізіцы.

СТАБІЛІЗА́ЦЫЯ (ад лац. stabilis устойлівы, пастаянны), прывядзенне чаго-н. ва ўстойлівы стан і падтрымка гэтага стану на вызначаным узроўні; забеспячэнне пастаянства якіх-н. велічынь, працэсаў, уласцівасцей. Напр., *стабілізацыя палімераў*, *стабілізацыя частаты*, С. палітычных адносін і г.д.

СТАБІЛІЗА́ЦЫЯ ПАЛІМЕ́РАЎ, сукупнасць метадаў, што выкарыстоўваюць для захавання комплексу ўласцівасцей палімераў і палімерных матэрыялаў пры іх перапрацоўцы, працяглым захоўванні і эксплуатацыі. Асн. спосаб С.п. — увядзенне *стабілізатараў*.

Паводле механізму дзеяння стабілізатараў адрозніваюць ланцуговую (гл. *Ланцуговыя хімічныя рэакцыі*) і неланцуговую стабілізацыю. Ланцуговая С.п. (ланцуговае інгібіраванне) звязана з дэзактывацыяй актыўных цэнтраў ланцуговага працэсу; назіраецца пры тэрмаакісляльнай дэструкцыі палімераў пры 250—300 °С, калі стабілізатары (напр., фенолы, аміны, нафтолы) абрываюць ланцугі акіслення. Неланцуговая С.п. скіравана на дэзактывацыю рэчываў, што прымаюць удзел у любых рэакцыях, якія прыводзяць да *старэння палімераў*. Часам С.п. дасягаецца змяненнем надмалекулярнай структуры палімера (т.зв. структурная стабілізацыя) з дапамогай спец. дабавак, тэрмічнай апрацоўкі матэрыялу і шляхам мех. ўздзеяння (арыентацыі).

Літ.: Грасси Н., Скотт Дж. Деструкция и стабилизация полимеров: Пер. с англ. М., 1988. *М.Р.Пракапчук.*



Функцыянальная схема электрычнага **стабілізатара** з адваротнай сувяззю: x — велічыня параметра, які стабілізуецца; x_0 — апорная велічыня; a — каэфіцыент, які характарызуе работу параўнальнага прыстасавання; K — каэфіцыент узмацнення; S — кіравальнае ўздзеянне.

насці вагальнасці сістэмы, тэрмастатыраваннем аўтагенератара, стабілізацыяй сілкавальных напружанняў і інш. Найб. пашырана кварцавая С.ч. (гл. *Кварцавы генератар*). Найб. С.ч. маюць *квантавыя стандарты частаты*.

СТАБІЛІТРО́Н [ад грэч. stabilis устойлівы, пастаянны + *(элек)трон*], газаразрадны ці паўправадніковы *дыёд*, напружанне на якім застаецца практычна пастаянным пры зменах (у пэўных межах) сілы току, што працякае праз яго. Прызначаны для стабілізацыі напружання.

Прынцып дзеяння газаразраднага С. грунтуецца на рэзкім нарастанні току пры тлеючым ці каронным разрадзе. Такія С. маюць халодны (ненапалены) катод. Межы стабілізацыі ад 70 да 160 В (С. тлеючага разраду) і ад 0,4 да 30 кВ (С. кароннага разраду). Паўправадніковы С. працуе ў вобласці адваротных напружанняў дыёда, якая адпавядае эл. прабою яго электронна-дзірачнага пераходу. Ме-



Стабілітрон кароннага разраду: 1 — балон, запоўнены вадародам; 2 — анод; 3 — катод.

жы стабілізацыі ад 3 да 180 В. С. выкарыстоўваюцца ў параметрычных стабілізатарах напружання, апорных крыніцах сілкавання, калібратарах току і напружання, лічбавых вымяральных прыладах і інш. *А.А.Кураеў.*

СТАБІ́ЛЬНАСЦІ ПРЫ́НЦЫП у эка л о г і і, канцэпцыя, у адпаведнасці з якой любая прыродная адносна замкнутая сістэма пры ўзаемадзеянні нежывога рэчыва і жывых арганізмаў з праходзячым праз гэтую сістэму патокам энергіі здольная да развіцця ў бок устойлівага стану пры дапамозе самарэгулюючых механізмаў (працэсаў). Такой сістэмай можа быць і біясфера Зямлі, і невял. экасістэма, напр., возера. У выпадку кароткачасовага дэстабілізуючага ўздзеяння звонку такія механізмы забяспечваюць вяртанне сістэмы да стабільнага стану, пры дасягненні якога перанос энергіі звычайна ідзе ў адным напрамку, з пастаяннай хуткасцю і садзейнічае падтрыманню ўстойлівасці сістэмы. Здольнасць да самастойнага дасягнення стану стабільнасці ўласціва толькі жывым сістэмам (папуляцыям, экасістэмам, біясферы ў цэлым). Прыватны выпадак С.п. — п р а в і л а с т а б і л ь н а с ц і ў з р о с т а в а й с т р у к т у р ы папуляцыі, у адпаведнасці з якім любая прыродная папуляцыя імкнецца да ўстанаўлення стабільнай узроставай структуры. Змены ў знешнім асяроддзі ці ўнутры папуляцыі звычайна прыводзіць да ўзнікнення новага стабільнага размеркавання ўзростаў у папуляцыі. Выяўлена амер. біяфізікам А.Дж.Лотка (1925). *А.М.Петрыкаў.*

СТАБІ́ЛЬНАСЦЬ, стан устойлівасці, пастаянства; з'яўляецца ўласцівасцю стабільнага і вынікам *стабілізацыі*.

СТАБРО́ЎСКІ Іосіф Іосіфавіч (2.11.1869, г. Слонім Гродзенскай вобл. — 15.1.1968), бел. археолаг і краязнавец. Чл.-кар. Віленскага аддз. Маск. археал. т-ва і Яраслаўскага археал. т-ва. Скончыў *Полацкі кадэцкі корпус* (1889), Аляксандраўскае ваен. вучылішча (1891), Маск. археал. ін-т (1909 ?), археал. курсы пры Саратаўскім ун-це (1910—11 ?). З канца 19 ст. займаўся гісторыяй і археалогіяй Беларусі, праводзіў раскопкі ў Гродзенскай і інш. губернях, збіраў калекцыі кніг і археал. знаходак. Удзельнік 1-й сусв. вайны, палкоўнік. З 1918 у Чырв. Арміі. У 1921 вярнуўся на радзіму, выкладаў гісторыю Слонімшчыны і Гродзеншчыны. Сабраная ім вял. калекцыя гіст.-археал. матэрыялаў у 1920-я г. стала асновай *Слонімскага краязнаўчага музея*, дзе С. працаваў дырэктарам і хавальнікам фондаў. У час. Вял. Айч. вайны захаваў археал. калекцыі музея і л-ру.

Літ.: А л е к с е е в Л.В. Археология и краеведение Беларуси XVI в. — 30-е гг. XX в. Мн., 1996. *Я.Г.Звяруга, А.М.Лукашэвіч.*

СТАБРО́ЎСКІ Казімір (21.11.1869, б. маёнтак Крупляны, Карэліцкі р-н Гродзенскай вобл. — 8.6.1929), жывапісец, педагог. Творчасць звязана з маст. жыццём Беларусі, Польшчы, Расіі. Вучыўся ў Пецярбургскай АМ (1887—94), акадэміі Жуліяна ў Парыжы. Пасля 1894 жыў і працаваў на Гродзеншчыне. Удзельнічаў у маст. выстаўках у Пецярбургу, Парыжы, Мюнхене, Венецыі. З 1902 чл. Т-ва польскіх мастакоў «Штука» і Т-ва падтрымкі прыгожых мастацтваў. Заснавальнік і кіраўнік (1904—09) Школы прыгожых мастацтваў у Варшаве. У 1922 заснаваў аб'яднанне мастакоў «Sursum Corda». Ствараў кампазіцыі фантастычна-сімвалічнага характару, пейзажы, партрэты ў стылі мадэрн. Сярод работ: «Магамет у пустыні» (1894), «Цішыня ў вёсцы» (паміж 1894—1900), серыя з 11 карцін «Шэсце навальніцы», «Белая ноч у Петраградзе каля раз'езда», «Змяркання ў Лазенкаўскім парку ў Варшаве», «Белыя ночы», партрэты С.Дамброўскага, Ф.Радашэўскага, Л.Рытлінскай, В.Семяшковай і інш.

СТАВА́НГЕР (Stavanger), горад на ПдЗ Нарвегіі. Адм. ц. фюльке Ругалан. Каля 150 тыс. ж. з прыгарадамі (2000). Порт на ўзбярэжжы Паўн. мора. Аэрапорт. Прам-сць: маш.-буд., у т.л. суднабуд., вытв-сць нафтавых платформ і буравога абсталявання; нафтаперапр., харч. (пераважна рыбаперапр.), тэкстыльная. Асн. цэнтр. абслугоўвання здабычы нафты і газу ў нарвежскім сектары Паўн. мора. Цэнтр рыбалоўства. Музей (археал. калекцыі), галерэя мастацтваў. Арх. помнік — рамана-гатычны сабор (1130—1300).

СТА́ВЕР Алесь (Аляксандр Сяргеевіч; 10.8.1929, в. Маргавіца Докшыцкага р-на Віцебскай вобл. — 23.7.1995), бел. паэт. Скончыў Мінскі пед. ін-т (1954). Настаўнічаў, працаваў у Белдзяржфілармоніі, Ін-це мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН Беларусі, у Бюро прапаганды маст. л-ры Саюза бел. пісьменнікаў. Друкаваўся з 1949. Першы зб. вершаў «Золак над Бярозай» (1959). Зб-кі вершаў «Ластаўкі перад дажджом» (1967), «Жураўлі ляцяць...» (1972), «Лірнік» (1975), «Жнівеньскі вырай» (1979),



І.І.**Стаброўскі**.



А.**Ставер**.

«Мой край беларускі» (1983), «Зоры зямныя» (1989) пра любоў да роднай зямлі, працоўныя будні, мінулае народа, маладосць і каханне. Раман «Пад канвоем» (1966), кнігі аповесцей і апавяданняў «Да сваіх» (1974), «Лясныя аповесці» (1986) пра Вял. Айч. вайну. Аўтар лірычнай камедыі «Алімпіяда Салодкая», п'есы «Слова — не верабей» (абедзве паст. 1977). Для дзяцей зб-кі «Касцёр не гасне» (1961), «Пад вясёлкавай дугой» (1984). На многія яго вершы напісаны песні («Жураўлі на Палессе ляцяць», «Косіць хлопец канюшыну», «А мне ў шчасце верыцца», «Беларусачка» і інш.).

СТАВО́К, возера ў Браслаўскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Дрысвята, за 23 км на ПдЗ ад г. Браслаў. Пл. 0,25 км^2, даўж. каля 1,4 км, найб. шыр. 360 м, найб. глыб. 2,3 м, даўж. берагавой лініі 3,9 км. Пл. вадазбору 666 км^2. Катлавіна падпруднага тыпу. Схілы выш. 6—10 м (на З да 25 м), разараныя, участкамі тэрасаваныя (выш. тэрасы 0,7—1 м). Берагі нізкія. Ёсць 3 вузкія залівы, востраў 0,2 га. Дно да глыб. 1 м пясчанае, глыбей ілістае, на Пд — сапрапелістае. Зарастае падводнай расліннасцю. Праз возера цячэ р. Прорва (злучае з азёрамі Дрысвяты і Аболе).

СТАВО́К, вёска ў Пінскім р-не Брэсцкай вобл., на правым беразе р. Мерачанка, на аўтадарозе Пінск—Іванаэвічы. Цэнтр сельсавета. За 10 км на Пн ад горада і чыг. ст. Пінск, 180 км ад Брэста. 398 ж., 163 двары (2001). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Помнік архітэктуры — Ушэсцеўская царква (1855).

СТА́ВЫ, вёска ў Воўчынскім с/с Камянецкага р-на Брэсцкай вобл., на левым

беразе р. Пульва. Цэнтр калгаса. За 56 км на ПдЗ ад г. Камянец, 30 км ад Брэста, 20 км ад чыг. ст. Высока-Літоўск. 510 ж., 188 двароў (2001). Базавая школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі. Свята-Ануфрыеўская царква. Брацкая магіла сав. воінаў. Каля вёскі помнік сав. пагранічнікам.

СТАГАКІ́Д, машына для ўкладкі сена і саломы ў стагі або сцірты, а таксама для пагрузкі копаў у трансп. сродкі.

Бываюць трактарныя паўнавясныя і навясныя з грабельным апаратам, кранавыя маторныя перасоўныя з паваротнай або непаваротнай платформай і захопным прыстасаваннем, перакідныя і элеватарныя. С. выкарыстоўваюць і для пагрузкі гною, сіласу, зерня, мінер. угнаенняў, штучных грузаў, пры гэтым іх абсталёўваюць зменнымі рабочымі органамі (віламі, каўшамі, крукамі). На Беларусі С. з грабельнай рашоткай выпускаў у 1953—63 з-д «Гомсельмаш», навясныя С. на трактар МТЗ 80/82 выпускаюць з-д «Мазырмеліярмаш» і інш.



Стагакід: 1 — грабельная рашотка; 2 — гідрацылінды; 3 — цяга; 4 — рамы пад'ёмная і апорная; 5 — коўш.

СТАГАНО́ВІЧ Тамара Аляксандраўна (н. 15.11.1930, в. Несутычы Навагрудскага р-на Гродзенскай вобл.), амерыканская мастачка бел. паходжання. Скончыла Калумбійскі ун-т у Нью-Йорку (1956). З 1950 жыве ў ЗША. Асн. творы адметныя вытанчанасцю і ўнутр. спакоем. Сярод жывапісных работ: партрэты Ф.Скарыны, трыпціхі «Любоў, Вера, Надзея» і «А вясны не спыніць, не стрымаць», «Статуя Свабоды», «Чырвоны камень», «Зубры», «Ручай зімою»; графічныя творы «Чыкары», «Барсук», цыкл «Таос Пуэбла» і інш.

С.Я.Крыштаповіч.

СТАГНА́ЦЫЯ (франц. stagnation ад лац. stagno раблю нерухомым, спыняю), дэпрэсія ў эканоміцы, застой у вытв-сці, гандлі і інш., якія папярэднічаюць спаду або суправаджаюць яго; перыяд нізкай актыўнасці на рынку каштоўных папер. Настае ва ўмовах, калі вытв-сць вычарпала ўнутр. рэзервы і рухаючыя сілы свайго развіцця. Асн. прыкметы С.: наяўнасць незагружаных вытв. магутнасцей на прадпрыемствах, затрымка інвестыцыйнага працэсу, нулявыя ці нязначныя (меншыя за 3%) тэмпы росту або адмоўная велічыня гэтага росту з улікам інфляцыі, нязменныя структуры эканомікі і яе неўспрыімлівасць да дасягненняў навук.-тэхн. прагрэсу. С. была характэрна для эканомікі ЗША у 1930-я г. і для сав. эканомікі з сярэдзіны 1980-х г.

М.В.Радзіеўскі.

СТАГО́ДДЗЕ, прамежак часу ў 100 гадоў — век; таксама стогадовы юбілей каго- ці чаго-небудзь.

СТАГО́РСКІ (сапр. Пяцігорскі) Аляксандр Паўлавіч (26.2.1910, г. Днепрапятроўск, Украіна — 6.1.1987), віяланчэліст, педагог. Праф. (1961). Скончыў Маскоўскую кансерваторыю (1934). З 1936 выкладаў у Маскоўскай, Уральскай, Горкаўскай, у 1954—62 Бел. кансерваторыях. З 1963 у Маскоўскім муз.-пед. ін-це імя Гнесіных. Першы выканаўца прысвечаных яму канцэртаў для віяланчэлі з арк. А.Багатырова, В.Залатарова, А.Масалова, рэдактар твораў бел. кампазітараў М.Аладава, Багатырова, Залатарова і інш. Пісаў выканальніцкія і тэксталагічныя творы для віяланчэлі. Аўтар артыкулаў па праблемах методыкі ігры на віяланчэлі. Лаўрэат 3-га Усесаюзнага конкурсу музыкантаў-выканаўцаў (1937).

М.С.Шчарбакоў.

СТАГУ́РСКАЯ Зінаіда Уладзіміраўна (н. 9.2.1971, г. Віцебск), бел. спартсменка (веласіпедны спорт, шашэйныя гонкі). Майстар спорту міжнар. класа (1991). Чэмпіёнка свету (2000, г. Плуэ, Францыя) у групавой гонцы. Пераможца XII міжнар. велагонкі «Джыра д'Італія» (2001), велагонак «Джыра Таскана» (1999, 2000). З 1997 у Італіі.

СТАГФЛЯ́ЦЫЯ [*стаг* (*нацыя*) + (*ін*)*фляцыя*], стан эканомікі, калі адначасова адбываецца спад вытв-сці, рост цэн і беспрацоўя, спалучэнне *крызісу эканамічнага* з інфляцыяй. Тэрмін «С.» ўжываецца з 1970-х г., калі павышэнне цэн на нафту стала прычынай росту інфляцыі пры запавольванні эканам. развіцця. Прычыны С. розныя эканамісты тлумачаць па-рознаму: структурнай недасканаласцю эканомікі (адсутнічае неабходны ўзровень канкурэнцыі, што парушае працэс самарэгулявання цэн); уладай манаполій над рынкам (часта манапалісту выгадна рабіць менш і прадаваць даражэй); інфляцыйнымі чаканнямі (уладальнікі фактараў вытв-сці ў чаканні інфляцыі завышаюць кошт сваіх паслуг).

СТАДНЮ́К Іван Фоціевіч (8.3.1920, с. Кардышоўка Вінніцкага р-на, Украіна — 30.4.1994), рускі пісьменнік. Скончыў Маскоўскі паліграфічны ін-т (1957). У Вял. Айч. вайну ваен. журналіст. Удзельнічаў у абарончых баях 1941 на Беларусі. Ганаровы грамадзянін г. Смаленск і в. Баравое Дзяржынскага р-на Мінскай вобл., дзе з 26.6 да 7.7.1941 удзельнічаў у цяжкіх баях. Друкаваўся з 1940. Раман «Людзі не анёлы» (ч. 1—2, 1962—65, аднайм. п'еса 1967) пра жыццё ўкр. сяла. Аўтар раманаў «Вайна» (кн. 1—3, 1970—80, Дзярж. прэмія СССР 1983), «Масква, 41-ы» (1985), шматлікіх апавяданняў і аповесцей пра Вял. Айч. вайну, п'ес, кінасцэнарыяў і інш. Эпізоды баёў на бел. зямлі ўзнаўляюцца амаль ва ўсіх яго буйных творах. У нарысах з кн. «Любоў мая і боль мой...» (1977), «Запаветнае» (1980), «Жалезныя вятры» (1982) расказаў пра многіх байцоў і камандзіраў — ураджэнцаў Беларусі.

Тв.: Собр. соч. Т. 1—4. М., 1982—85.

Літ.: Леонов Б. Главный объект: Очерк творчества И.Стаднюка. М., 1978.

СТАДО́ЛА, тое, што *гумно*.

СТАДО́ЛІЧЫ, вёска ў Лельчыцкім р-не Гомельскай вобл., на аўтадарозе Лельчыцы—Славечна. Цэнтр сельсавета і камунальнага с.-г. унітарнага прадпрыемства. За 14 км на ПдУ ад г.п. Лельчыцы, 221 км ад Гомеля, 63 км ад чыг. ст. Ельск. 914 ж., 389 двароў (2001). Лясніцтва. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.



Т.**Стаганові́ч**. Любоў, Вера, Надзея.

СТАДО́ЛІЧЫ 1-я, радовішча глін і суглінкаў у Лельчыцкім р-не Гомельскай вобл., за 5 км на ПнЗ ад в. Стадолічы. Пластападобны паклад звязаны з нерасчлянёнымі адкладамі палеагенавай і неагенавай сістэм. Гліны і суглінкі шэрыя, жаўтаватыя, месцамі з бурымі плямамі ажалязнення, шчыльныя, вязкія; прыдатныя на выраб цэглы. Разведаныя запасы 1,9 млн. м^3. Магутнасць карыснай тоўшчы 1,6—7,3 м, ускрышы (пяскі) 0,5—3 м. Разведаныя запасы пяскоў ускрышы 0,2 млн. м^3. *А.П.Шчураў.*

СТАДО́ЛІШЧА, вёска ў Гарадоцкім р-не Віцебскай вобл., на аўтадарозе Гарадок—Мяжа. Цэнтр сельсавета і саўгаса. За 12 км на ПнУ ад горада і чыг. ст. Гарадок, 49 км ад Віцебска. 244 ж., 96 двароў (2001). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

СТАДО́ЛЬНІК Іван Канстанцінавіч (н. 12.9.1940, в. Янкі Докшыцкага р-на Віцебскай вобл.), бел. пісьменнік. Скончыў Полацкае медвучылішча (1963), БДУ (1971). Працаваў у калгасе, урачом, у полацкай газеце. У 1980—91 і 1998—99 у час. «Вожык», у 1991—98 у час. «Тэатральная Беларусь» («Тэатральная творчасць»). Дэбютаваў вершамі ў 1960. Аўтар зб. апавяд. «Хачу табе шчасця» (1979), кніжак сатыры і гумару «Як тут не смяяцца» (1985), «Лістапад на пачатку лета» (1987), камедыі-фарса «Залатое вяселле» (1995). *І.У.Саламевіч.*

СТАДЫЁН (ад грэч. stadion месца для спаборніцтваў), збудаванне для правядзення спаборніцтваў і трэніровак па розных відах спорту. Мае спарт. арэну (ігравое поле, бегавыя дарожкі, сектары для лёгкай атлетыкі), трыбуны для гледачоў, спарт. пляцоўкі з дапаможнымі збудаваннямі і памяшканнямі. Падзяляюцца на малыя (плошча 5—10 га, трыбуны на 1,5—3 тыс. месцаў), сярэднія (плошча 15—20 га, трыбуны на 10—12 тыс. месцаў) і вял. (плошча больш за 25 га, трыбуны больш як на 25 тыс. месцаў).

Першыя С. будавалі ў Стараж. Грэцыі ў Алімпіі, Афінах, Дэльфах і інш. гарадах для правядзення Алімп. гульняў. Пасля адраджэння гульняў у 1896 С. будуюць у многіх краінах. Яны ўтвараюць комплексы збудаванняў для здараўлення, навучальна-трэніровачных заняткаў, спарт. спаборніцтваў па розных відах спорту. У 1950—60-я г. атрымалі пашырэнне крытыя С. Самы буйны ў свеце адкрыты С. — Страгаўскі ў Празе (1934; 240 тыс. гледачоў). Найб. вядомыя С. 2-й пал. 20 ст. — алімп. ў Рыме і Мюнхене (Германія), Уімблдан і Уэмблі ў Лондане, «Ноу Камп» у Барселоне (Іспанія), спарт. комплексаў «Лужнікі» і «Алімпійскі» ў Маскве і інш.

На Беларусі (у Мінску і абл. цэнтрах) у 1920—30 пабудавана 14 С.; у Вял. Айч. вайну ўсе разбураны; пасля вайны адноўлены, пабудаваны новыя. Існуюць 220 С. з трыбунамі ад 1,5 тыс. да 50 тыс. месцаў (2001). Найбольшыя С.: у Мінску — «*Дынама*», «Трактар» (пабудаваны ў 1968, рэканструяваны ў 1978 і 1998, 25 тыс. месцаў); у Брэсце — «Дынама» (1937, рэканструяваны ў 1951, 10,6 тыс.), «Лакаматыў» (1972, 3 тыс.); у Віцебску — «Дынама» (1937, рэканструяваны ў 1980—86, 5 тыс.), «Лакаматыў» (1964, 1,5 тыс.); у Гомелі — «Лакаматыў» (1926, 15 тыс.), «Гомсельмаш» (1966, 9,7 тыс.); у Гродне — «Нёман» (1963, 15 тыс.); у Магілёве — «Спартак» (1956, рэканструяваны ў 1982, 12 тыс.).



Стадыён у Барселоне.

СТА́ДЫЯ [новалац. stadium, мн.л. stadia ад грэч. stadion стадый (мера даўжыні)], пэўная ступень (перыяд, этап, фаза) у развіцці чаго-н., якая мае свае адметныя асаблівасці. Напр., унутрывантробная С. развіцця арганізма.

СТА́ЕР (англ. stayer, літар. — выносліцы чалавек), спартсмен, які спецыялізуецца ў бегу ці гонках на доўгія дыстанцыі (напр., 3000, 5000, 10 000 м), у адрозненне ад *спрынтэра*. С. наз. таксама спарт. конь, які дасягнуў найб. хуткасці ў скачках на доўгіх дыстанцыях.

СТАЖА́РАЎ Аляксандр Мікалаевіч (н. 12.12.1946, Ташкент), бел. вучоны ў галіне біяхіміі, радыяцыйнай і экалагічнай медыцыны. Д-р біял. н. (1987), праф. (1990). Скончыў Мінскі мед. ін-т (1971). З 1990 і з 1996 у Мінскім мед. ін-це (заг. кафедры). У 1993—96 у НДІ радыяцыйнай медыцыны (дырэктар). Навук. працы па пытаннях рэгуляторных механізмаў энергет. абмену ў клетках, малекулярных асновах і мед. наступствах уздзеяння малых доз радыяцыі. Даказаў існаванне бялку, падобнага да актыну мышцаў у мітахондрыях нямышачных клетак.

Тв.: Выделение и характеристика актиноподобного белка митохондрий печени // Биохимия. 1984. Т. 49, вып. 11; Некоторые тенденции в общесоматической заболеваемости населения Беларуси после катастрофы на ЧАЭС // Здравоохранение. 1996. № 5; Экологическая медицина. Мн., 2001.

СТАЖА́РЫ, тое, што *Плеяды*.

СТАЖО́Р (ад франц. stagiaire), асоба, якая праходзіць выпрабавальны стаж перад залічэннем на штатную пасаду, а таксама часовы працаўнік, які набывае вопыт работы ці павышае кваліфікацыю па спецыяльнасці на прадпрыемстве, у навуч. установе і інш.

СТАЖЫРО́ЎКА, 1) выпрабавальны тэрмін, на які прымаецца работнік для праверкі адпаведнасці яго даручанай рабоце і набыцця неабходных навыкаў. Паводле заканадаўства Рэспублікі Беларусь С. звычайна не павінна перавышаць 6 месяцаў, а пры прыёме на некваліфікаваную работу — двух тыдняў. Умовы аб выпрабаванні павінны быць пазначаны ў загадзе (распараджэнні) аб прыёме на работу. Калі тэрмін С. скончыўся, а работнік працягвае працаваць, лічыцца, што ён вытрымаў выпрабаванне і залічаны ў штат. С. не ўстанаўліваецца пры прыёме на работу інвалідаў і асоб, якія не дасягнулі 18 гадоў, а таксама маладых рабочых пасля заканчэння прафес.-тэхн. навуч. установ і маладых спецыялістаў пасля заканчэння вышэйшых і сярэдніх спец. навуч. устаноў і ў некаторых інш. выпадках, прадугледжаных заканадаўствам. 2) Работа па спецыяльнасці на працягу пэўнага тэрміну (выпрабавальны стаж) для вызначэння магчымасці залічэння на штатную пасаду ў некаторых праваахоўных органах (пракуратуры, адвакатуры, судзе) і ў інш. арг-цыях, мастацкіх калектывах; С. маладых спецыялістаў і работнікаў НДІ і ВНУ для падрыхтоўкі іх да навук. або пед. дзейнасці, выкладчыкаў вышэйшай школы з мэтай павышэння іх кваліфікацыі (з магчымай камандзіроўкай іх за мяжу).

СТАЖЭ́НСКІ (Старжынскі) Віктар Вацлаў (Віктар Мацвеевіч; 26.9.1826, маёнтак Страбля Падляскага ваяв., Польшча — 31.5.1882, паводле інш. звестак 17.6.1882), бел. грамадскі дзеяч ліберальнага кірунку 1860-х г. Вучыўся ў езуіцкім пансіёне ў Швейцарыі і Мюнхенскім ун-це. У 1847—50 у рас. арміі. З 1861 гродзенскі губернскі маршалак шляхты. Вёў перагаворы з царскімі ўладамі наконт аўтаноміі Беларуска-Літоўскага краю, аднаўлення Віленскага ун-та. У час. паўстання 1863—64 адзін з кіраўнікоў партыі «белых» у Беларусі і Літве. Вясной 1863 згодна з загадам паўстанцкага ўрада падаў у адстаўку і звярнуўся з адпаведным цыркулярам да павятовых маршалкаў шляхты. У маі 1863 арыштаваны, зняволены ў Віленскую цытадэль і засуджаны да высылкі ў Сібір. Пазней пакаранне зменшана: адсядзеў паўтара года ў Бабруйскай крэпасці, потым высланы ў Варонежскую губ. У 1869—75 жыў у Галіцыі, потым у Пецярбургу.

Літ.: Смирнов А.Ф. Восстание 1863 г. в Литве и Белоруссии. М., 1963. *Г.В.Кісялёў.*

СТАЖЭ́ЎСКІ (Stażewski) Генрых (9.1.1894, Варшава — 10.6.1988), польскі мастак; заснавальнік кірунку геам. абстракцыянізму ў польскім мастацтве. Скончыў Варшаўскую акадэмію прыгожых мастацтваў (1920). У 1923 з У.Страмінскім, К.Кобра і інш. заснаваў аб'яднанне геам. абстракцыяністаў «Блок» і аднайм. час. «Blok». У 1924—37 наведаў Парыж, Італію, Германію. Чл. міжнар. і польскіх аб'яднанняў мастакоў «Прэзенс» (і рэдактар аднайм. час. «Praesens», 1926), «Рэвалюцыйныя мастакі» (1930) і інш. З 1962 чл. Міжнар. асацыяцыі мастацтваў пры ЮНЕСКА. Быў прыхільнікам гарманічна рытмізаваных рэльефных кам-

пазіцый: «Контркампазіцыя» (1930—32), «Кампазіцыя» (1932), «Рэльеф чорна-блакітны», «Рэльеф блакітны», «Рэльеф бела-блакітна-жоўты» (усе 1958), «Рэльеф бела-шэры», «Рэльеф белы» (абодва 1961), «Рэльеф бела-чорны» (1962) і інш. *Я.Ф.Шунейка.*

СТАЗ (ад грэч. stasis стаянне, нерухомасць), застой, спыненне паступлення фізіял. змесціва ў прасвеце якога-н. трубчастага органа. Напр., С. крыві — гемастаз (часцей капілярны або вянозны), мачавы С., лімфастаз. Узнікае пад уздзеяннем хім. або фіз. фактараў, ядаў бактэрый, пры парушэнні інервацыі сасудаў, змене саставу крыві і інш. Стойкі гемастаз прыводзіць да *некрозу* тканак.

СТА́І, вёска ў Лепельскім р-не Віцебскай вобл., на аўтадарозе Лепель — Докшыцы. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 5 км на З ад горада і чыг. ст. Лепель, 120 км ад Віцебска. 990 ж., 303 двары (2001). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

СТАІЦЫ́ЗМ, школа ў *антычнай філасофіі*, прадстаўнікі якой імкнуліся абгрунтаваць унутр. незалежнасць, непахіснасць, нязломнасць асобы. Засн. каля 300 да н.э. *Зянонам* з Кітыёна ў Афінах; першапачаткова школа размяшчалася ў афінскім порціку Стоя (адсюль назва). У развіцці С. вылучаюць 3 перыяды: стараж. Стоя (3—2 ст. да н.э.; Зянон, Клеанф з Аса, Хрысіп Солскі і іх вучні Арыстон з Кеаса, Герыл Карфагенскі, Эратасфен Кірэнскі і інш.); сярэдняя Стоя (2—1 ст. да н.э.; Баэт, Панетый, Пасідоній) і позняя Стоя (рымскі С.; 1—2 ст. н.э.; Сенека, Эпіктэт, Марк Аўрэлій, Мусоній Руф і інш.). Некат. даследчыкі вылучаюць 4-ы перыяд у развіцці С., да якога адносяць эклектычных платонікаў і піфагарэйцаў 1—2 ст. н.э., а таксама Філона Александрыйскага. Стараж. Стоя характарызуецца жорсткасцю, рыгарызмам этычнага вучэння, сярэдняя — памякчэннем вучэння С. і выкарыстаннем метадаў Платона і Арыстоцеля, позняя — тэндэнцыяй да сакралізацыі. Філас. сістэма С. складаецца з 3 частак: фізікі (натурфіласофіі), этыкі і логікі. У аснове натурфіласофіі С. — вучэнне Арыстоцеля пра матэрыю і форму, адноўлены і значна перагледжаны касмалагізм Геракліта. Натурфілас. погляды стоікаў адрозніваюцца тэалагічнай, правідэнцыяльнай, фаталістычнай арыентаванасцю і эклектычнасцю. На іх думку, сусвет уяўляе сабой адушаўлёнае сферычнае цела, а першаасновай усяго існага з'яўляецца агонь («пнеўма», «дух», «дыханне»), іманентная ўласцівасць якога Логас. Паводле С., сусвет стварае і кіруе ім Першаагонь (Бог-Логас). Стоікі прызнавалі існаванне сусв. плана і ўсеагульнай мэтазгоднасці; лічылі, што свет развіваецца цыклічна. С. прызнае ўсеагульную цялеснасць, у т.л. Бога і душы. Душа чалавека разглядалася стоікамі як частка сусв. душы, якая са смерцю пакідае цела. У цэнтры С. — этычнае вучэнне. Дабрадзейнасць, паводле С., — гэта жыццё ў адпаведнасці з законамі прыроды, Логасу, але толькі мудрацы бяруць прыклад з прыроды з яе «бясстраснасцю». Гал. задачу філасофіі стоікі бачылі ў выпрацоўцы ў людзях «бясстраснасці» (стану, калі адсутнічаюць афекты) і маральнага абавязку. Лёс у С. разглядаецца як дадзенасць, непахісны факт, які пашыраецца і на чалавека, і на ўвесь космас, а свабода — як добраахвотнае падпарадкаванне чалавека знешнім абставінам. Стоікі ўпершыню ўвялі тэрмін *логіка*, пад якім разумелі навуку аб славесным выказванні. Логіка ў С. падзяляецца на рыторыку і дыялектыку, якая складаецца з вучэнняў пра гукі мовы (паэтыка, тэорыя музыкі і граматыка) і пра значэнне, сэнсавы бок мовы. Вучэнне С. паўплывала на *неаплатанізм* і хрысц. філасофію; этычныя погляды стоікаў развіваліся ў 17—18 ст.

Літ.: Лосев А.Ф. История античной эстетики: Ранний эллинизм. М., 1979; Ягож. Эллинистически-римская эстетика 1—II вв. н.э. М., 1979; Диоген Лаэртский. О жизни, учениях и изречениях знаменитых философов: Пер. с др.-греч. М., 1995; Ренан Э.Ж. Марк Аврелий и конец античного мира: Пер. с фр. М., 1991; Этика стоицизма: традиции и современность: [Сб. ст.]. М., 1991; Аврелий Марк. Размышления: Пер. с греч. Магнитогорск, 1994; Степанова А.С. Философия Древней Стои. СПб., 1995; Столяров А.А. Стоя и стоицизм. М., 1995; Асмус В.Ф. Античная философия. 3 изд. М., 2001. *Т.І.Адула.*



Г.**Стажэўскі**. Рэльеф блакітны. 1958.

СТА́ЙКАЎСКАЕ ПАТРЫЯТЫ́ЧНАЕ ПАДПО́ЛЛЕ ў Вялікую Айчынную вайну. Дзейнічала ў ліст. 1941 — жн. 1943 у в. Стайкі і Свістуны Багушэўскага (цяпер Аршанскага) р-на Віцебскай вобл. пад кіраўніцтвам Багушэўскага падп. райкома КП(б)Б. Падпольшчыкі (59 чал., кіраўнікі М.М.Дзятлоўскі, У.Т.Рыжыкаў) вялі паліт. агітацыю сярод насельніцтва, прымалі па радыё і распаўсюджвалі зводкі Саюзінфармбюро, лістоўкі, зрывалі аднаўленне чыгункі Орша — Віцебск, работу лесапільні, захапілі нарабаваныя акупантамі і перадалі партызанам адзенне і абутак, ратавалі людзей ад вывазу ў Германію, збіралі і перадавалі партызанам боепрыпасы, медыкаменты, харч. прадукты, разведданыя. За час дзейнасці загінулі 23 падпольшчыкі, астатнія пайшлі да партызан.

СТА́ЙКІ, вёска ў Аршанскім р-не Віцебскай вобл.; чыг. ст. на лініі Орша — Віцебск. Цэнтр сельсавета і вытв.-гасп. фірмы «Ніва». За 21 км на Пн ад г. Орша, 62 км ад Віцебска, 496 ж., 216 двароў (2001). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан. Магіла ахвяр фашызму. У Вял. Айч. вайну ў С. дзейнічала *Стайкаўскае патрыятычнае падполле.*

СТА́ЙКІ, вёска ў Баранавіцкім р-не Брэсцкай вобл., каля аўтадарогі Мінск — Брэст. Цэнтр Мядзеневіцкага с/с і калгаса. За 23 км на ПнУ ад г. Баранавічы, 225 км ад Брэста, 7 км ад чыг. ст. Перамога. 526 ж., 235 двароў (2001). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

СТА́ЙКІ, вёска ў Івацэвіцкім р-не Брэсцкай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 2 км на З ад горада і чыг. ст. Івацэвічы, 133 км ад Брэста. 1017 ж., 386 двароў (2001). Кандытарскі цэх. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Малітоўны дом евангельскіх хрысціян-баптыстаў. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

СТА́ЙКІ, вёска ў Кіраўскім р-не Магілёўскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 35 км на ПнУ ад г.п. Кіраўск, 80 км ад Магілёва, 35 км ад чыг. ст. Быхаў. 333 ж., 120 двароў (2001). Базавая школа, клуб, б-ка, амбулаторыя, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан.

«СТА́ЙКІ», алімпійскі спарт. комплекс за 12 км на ПдУ ад Мінска, паблізу магістралі Мінск — Магілёў. Засн. ў 1947, пабудаваны ў канцы 1960-х г. З 1970 гал. база падрыхтоўкі да чэмпіянатаў Еўропы, свету і Алімп. гульняў па роз-

ных відах спорту. Пл. 90 га. Комплекс уключае: 2 універсальныя залы-манежы (50×72 м, арх. П.Пугач, У.Машукоў; 54×36 м), 2-зальны гімнастычны комплекс, залы спецыялізаваныя для штангі з 12 памостамі, боксу з рынгам, трэнажорныя. павільён з трэніровачнымі прыстасаваннямі, 5 крытых 140-метровых бегавых дарожак з сінт. пакрыццём. На тэр. комплексу знаходзяцца 6 футбольных палёў, 5 тэнісных кортаў, 5 універсальных пляцовак, 5 валейбольных і 2 баскетбольныя пляцоўкі, 4 кругавыя 400-метровыя лёгкаатлетычныя дарожкі, вучэбныя гарадкі для скачкоў у вышыню і для кідання кап'я, вадасховішча. Функцыянуюць 8 гасцінічных карпусоў, медыка-рэабілітацыйны цэнтр, рэстаран, бары, буфеты, 2 кіназалы, канферэнц-зала, зала актыўнага адпачынку (більярд, настольны тэніс), б-ка, чытальная зала. У «С.» арганізоўваюцца і праводзяцца спарт.-масавыя мерапрыемствы рэсп. і міжнар. узроўняў, семінары, сімпозіумы і інш. *С.Дз.Філімонаў.*

СТАЙН (Stein) Гертруда (3.2.1874, г. Пітсбург, штат Пенсільванія, ЗША — 27.7.1946), амерыканская пісьменніца; тэарэтык л-ры. Вывучала псіхалогію ў Рэдкліфскім каледжы Гарвардскага ун-та, медыцыну — ва ун-це Дж.Хопкінса ў Балтымары. З 1902 жыла ў Парыжы. Маст. метад С. фарміраваўся пад уплывам эстэтыкі імпрэсіянізму, філасофіі А.*Бергсона* і экзістэнцыялістаў. Найб. значныя яе творы — раман «Станаўленне амерыканцаў» (1906—08, апубл. 1925) і аповесць «Тры жыцці» (1908), у якіх звярнулася да праблем адзіноты чалавека, яго адчужанасці ад грамадства, абсурднасці існавання. Аўтар кн. «Аўтабіяграфія Алісы Б.Токлас» (1933), мемуараў «Войны, якія я пабачыла» (1945), п'ес, зб-каў вершаў, эсэ, літ.-эстэт. прац, у т.л. «Як пісаць» (1931), «Лекцыі ў Амерыцы» (1935) і інш. Яе паэтыцы ўласцівы герметызм, эксперыменты з лексікай і сінтаксісам, кампазіцыяй і рытмам, асацыятыўнасць, вобразная абстрактнасць; выкарыстоўвала прынцыпы кінатэхнікі, авангардысцкага жывапісу, мастацтва фатаграфіі.

Тв.: Рус. пер. — Автобиография Алисы Б.Токлас. СПб., 2000.

Літ.: Бернацкая В. Гертруда Стайн: тупик или перспектива? // Совр. худ. лит. за рубежом. 1975. № 6. *Е.А.Лявонава.*

СТАЙН, Стэйн (Stein) Уільям Хоўард (25.6.1911, Нью-Йорк — 2.2.1980), амерыканскі вучоны ў галіне біяхіміі. Чл. Нац. АН ЗША і Амер. акадэміі мастацтваў і навук. Скончыў Гарвардскі



У.**Стайн**.

ун-т (1933). З 1939 у Ракфелераўскім ун-це (Нью-Йорк), з 1955 праф. біяхіміі. Навук. працы па аналіт. хіміі бялкоў і ферментаў. Распрацаваў колькасны метад вызначэння амінакіслот, заснаваны на іонаабменнай храматаграфіі, высветліў (разам з іншымі) першасную структуру ферменту рыбануклеазы. Нобелеўская прэмія 1972 (разам з К.*Анфінсенам* і С.*Мурам*).

СТА́ЙНЯ, канюшня, гаспадарчая пабудова для ўтрымання коней. Вядома са старажытнасці ў многіх народаў свету. На Беларусі пашырана з 10—11 ст. З 16 ст. вядомы С. драўляныя, мураваныя і мяшанай канструкцыі (у тэхніцы «прускага муру» або з дрэва ў цагляныя слупы — шулы). Канструкцыяй і кампазіцыяй маглі нагадваць хлявы. Ставілі іх паблізу ўязных брам або ў складзе гасп. комплексаў, накрывалі саломай, дранiцай, гонтай, на дахах рабілі металічныя флюгеры. У 17 ст. часам над цэнтр. ч. С. былі абарончыя збудаванні, залы, вежы. У некат. сядзібах 2—3 С. будавалі пад адным дахам або блакіравалі з хлявамі, вазоўнямі, карэтнымі майстэрнямі; часам 2 С. злучаліся *павеццю*. У буйных сядзібах і замках С. сумяшчаліся з *манежамі*. У 17 — пач. 20 ст. С. ўваходзілі ў комплексы корчмаў і аўстэрый, пастаялых двароў, паштовых станцый, ратуш і інш.

У сучасных спецыялізаваных гаспадарках вылучаюць асобна С. для жарабцоў-вытворнікаў, племянных кабыл, маладняку, трэнінгавыя. Пры табунным утрыманні будуюць С. толькі для вытворнікаў і трэнінгавыя. Уключае секцыі, стойлы ці праварыны для жывёл, цэнтр. кармагноевы праход і дапаможныя памяшканні (фуражную, збруйную, інвентарную і інш.). *Ю.А.Якімовіч.*

СТА́ЙРАН (Styron) Уільям (н. 11.6.1925, г. Ньюпарт-Ньюс, ЗША), амерыканскі пісьменнік; прадстаўнік т.зв. паўд. школы амер. рамана. Вучыўся ў Дэвідсан-каледжы (Паўд. Караліна) і ва ун-це Дзьюка. Бакалаўр мастацтваў і д-р л-ры. Дэбютаваў як пісьменнік у 1945. На яго творчасць паўплывалі У.*Фолкнер* і экзістэнцыялісты (раман «І падпаліў гэты дом», 1960). У гіст. рамане «Прызнанні Ната Тэрнера» (1967) мастацка-філас. асэнсаванне расавай праблемы. Маральна-філас. раман «Выбар Сафі» (1979, экранізаваны ў 1982) спалучае лірыка-біягр. аповед і сац.-псіхал. анатомію злачынства, ахвярнасці і пакут у Асвенціме. Аўтар аповесцей «Знікаю ў цемры» (1951), «Доўгі марш» (1952), зб-каў эсэ і публіцыстыкі.

Тв.: Рус. пер. — И поджег этот дом; Долгий марш. М., 1991; Выбор Софи. М., 1991.

Літ.: Мулярчик А. США: Век двадцатый. М.; Мн.; Барановичи, 1994; Комаровская Т.Е. «Признания Ната Тернера» У.Стайрона как философский исторический роман // Человек в контексте культуры и литературы США. Мн., 1996. Вып. 1. *Е.А.Лявонава.*

СТАКА́ТА (італьян. staccato адрывіста) у музыцы, кароткае, адрывістае выкананне гукаў; адзін з прыёмаў гуказдабывання (супрацьлеглы легата — звязанае выкананне гукаў).

СТАКГО́ЛЬМ (Stockholm), горад, сталіца Швецыі. Знаходзіцца ў сярэдняй частцы краіны, на берагах пратокі Норстрэм, якая злучае воз. Меларэн з зал. Сальтшэн Балт. мора. Адм. ц. аднайм. лена. 1583 тыс. ж. з прыгарадамі і суседнімі гарадамі (2000). Вузел чыгунак і аўтадарог, гал. марскі порт краіны. Міжнар. аэрапорт Арланда. Гал. эканам. і культ. цэнтр, прыпадае 10% прамысл. вытв-сці краіны. У С. знаходзяцца буйнейшыя банкі, праўленні вядучых прамысл. канцэрнаў і гандл. кампаній Швецыі. Прам-сць: маш.-буд. (эл.-тэхн., радыёэлектроннае, абсталяванне для харч. прам-сці, транспартнае), паліграф., харч., лёгкая, фармацэўтычная, хімічная. Метрапалітэн. АН. Ун-т. Стакгольмскі міжнар. ін-т даследаванняў праблем міру.

Рыбалоўныя і гандл. паселішчы ўзніклі на тэр. С. ў пачатку н.э. Паводле дакумент. звестак вядомы з 1252. У 2-й пал. 13 ст. атрымаў гар. права. З канца 13 ст. пастаянная рэзідэнцыя швед. ўрада. Як гал. горад Швецыі меў шматлікія прывілеі, у т.л. права манапольнага



Алімпійскі спартыўны комплекс **«Стайкі»**.

гандлю, гар. самакіравання і суда. У сярэдневяковай найбуйнейшы рамесны цэнтр (у 1356 у С. ўзніклі першыя ў Швецыі рамесніцкія цэхі), важны гандл. порт. У 1520 заняты датчанамі і стаў месцам масавых пакаранняў праціўнікаў дацкага караля Крысціяна II (т. зв. Стакгольмская крывавая лазня). Пасля выгнання датчан (1523) горад хутка рос як эканам. і паліт. цэнтр, стаў буйнейшым экспарцёрам жалеза і чыгуну. У 1862 скасаваны сярэдневяковы магістрат, горад атрымаў уласнае муніцыпальнае заканадаўства. У 1900 у С. засн. *Нобелеўскі фонд*, тут з 1901 прысуджаюцца *Нобелеўскія прэміі*. У 1912 месца правядзення V летніх Алімп. гульняў. У С. шмат разоў праходзілі міжнар. сустрэчы, кангрэсы, нарады, з'езды. У 1948—75 у С. дзейнічала суполка «Беларуская грамада» (заснавальнік бел. эмігрант В.Лукашык).

Гіст. ядро С. — Гамла стан, ці Стары горад, — склалася на в-ве Стадэн, з інш. часткамі цэнтра злучана шматлікімі масцямі. Захаваліся помнікі сярэдневяковага дойлідства: 2 вежы гар. умацаванняў (2-я пал. 15 ст.), раманска-гатычныя храмы Стурчурка (13 ст., фасад перабудаваны ў 1736—42 у стылі класіцызму) і Рыдархольмскурка (1270—1310; каралеўская пахавальня 1671—1743, арх. Н.Тэсін Старэйшы і Н.Тэсін Малодшы, барока). У 17 ст. ўзводзілі культавыя і свецкія будынкі з элементамі позняга рэнесансу і барока (царква Цюскачурка, каля 1640, арх. Х.Я.Крыстлер). Узоры швед. сталага барока: палацы Дротнінгхольм (з 1662, арх. Тэсін Старэйшы) і каралеўскі (1697—1760, арх. Тэсін Малодшы і інш.); у паўд. яго крыле царква Слотсчурка). Сярод інш. помнікаў: біржа (1768—76, арх. К.Ю.Кронстэт, Э.Пальмстэт, ракако), у духу нац. рамантызму — Паўн. музей (1892—1906, арх. І.Г.Класан), ратуша (1911—23, арх. Р.Эстберг) і царква Хёгалідсчурка (1914—22, арх. І.Тэнгбум); «Лясны крэматорый» (1935—40, арх. Э.Г.Асплунд). Генплан С. 1944—52 (праект арх. С.Г.Маркеліуса і інш.) прадугледжваў рост горада шляхам стварэння групы паўаўтаномных раёнаў, звязаных з цэнтрам радыяльнымі трансп. лініямі (Велінгбю, Фарста, Шэрхальмен). З пабудоў 2-й пал. 20 ст. вылучаецца Культ. цэнтр з будынкам новага рыксдага (1966—73, арх. П.Сельзінг). Музеі: нац., этнагр. пад адкрытым небам у парку Скансэн, «Мілесгордэн» («Сад Мілеса»). Т-ры: муз. швед. каралеўская опера, «Оскар-тэатр», Каралеўскі драм. т-р і інш.

СТАКГО́ЛЬМСКАЯ ШКО́ЛА ў палітэканоміі. Склалася ў Стакгольме ў пач. 1930-х г. ва ўмовах сусв. эканам. крызісу 1929—33 з мэтай пошуку практычных захадаў яго пераадолення. Тэарэт. асновай яе канцэпцыі былі працы швед. эканамістаў Д.Давідсана, К.Вікселя, Г.Каселя і інш., якія лічылі, што для эканам. раўнавагі паміж попытам і прапановай, ліквідацыі дыспрапорцый паміж аб'ёмамі інвестыцый і збераженняў патрэбна дзярж. ўмяшанне ў эканоміку. Яны распрацавалі тэорыю прамысл. цыкла, у якім праблемы цэн, даходаў, грошай і эканам. цыкла аб'ядноўвалі ў адзінае цэлае, падкрэслівалі, кумулятыўны саманарастальны характар эканам. працэсаў. Прадстаўнікі школы Э.Ліндаль, *Г.К.Мюрдаль*, Б.Олін, Э.Лундберг незалежна ад *Дж.М.Кейнса* абгрунтавалі ролю дзярж. рэгулявання эканомікі, актыўнай інвестыцыйнай палітыкі на макраэканам. узроўні, пабудавалі мадэлі для аналізу сувязі інфляцыі і беспрацоўя, тэорыі грошай і інш. Сучасная канцэпцыя С.ш., якая складалася пасля 2-й сусв. вайны, інтэгрыруе ідэі макраэканам. дзярж. рэгулявання эканомікі з рэкамендацыямі па яе аўтаматычным самарэгуляванні з мэтай падтрымкі функцыянавання рыначнага механізма; з 1980-х г. больш увагі аддаецца праблемам эфектыўнасці дзярж. сектара эканомікі, падаткаабкладання, канкурэнтаздольнасці тавараў і паслуг, суадносін узроўняў сац. абароны працоўных і стымулявання працы.

А.В.Бондар.

СТА́КЕР (англ. stacker ад stack складваць штабелямі), адвалаўтаральнік, штабелявальны канвеер. Бывае скрабковы — для штабелявання кароткіх лесаматэрыялаў на лясных складах ці стужачны — для пяску, гравію, руды, вугалю і інш. Перамяшчаецца па рэйках.

СТАКО́ЎСКІ (Stokowski) Леапольд (18.4.1882, Лондан — 13.9.1977), амерыканскі дырыжор. Паляк па паходжанні. Вучыўся ў Каралеўскім муз. каледжы ў Лондане, атрымаў ступень бакалаўра муз. мастацтва ў Каледжы каралевы ў Оксфардзе (1903). З 1905 жыў пераважна ў ЗША. Кіраваў Філадэльфійскім (1912—36), Х'юстанскім (1949—60), Амер. (Нью-Йорк, 1961—73) сімф. аркестрамі. Прапагандаваў музыку 20 ст., у т.л. С.Рахманінава, С.Пракоф'ева, М.Мяскоўскага. Здымаўся ў кіно.

Тв.: Рус. пер. — Музыка для всех нас. М., 1963.

Літ.: Птица К. Три «мимолетности» // Сов. музыка. 1980. № 4.

СТАКРО́ТКА, маргарытка (Bellis), род кветкавых раслін сям. складанакветных. 6—7 відаў. Пашыраны ў Еўропе і Міжземнамор'і. На Беларусі 1 від — С. шматгадовая (B. perennis). Трапляецца на вільготных лугах, узлесках. Культывуецца, мае махрыстыя формы і сарты з розным колерам кветак.

Шматгадовыя, радзей аднагадовыя расліны выш. 3—25 см. Шматлікае лісце ў прыкаранёвай разетцы, суцэльнае, часта па краі зубчастае. Кветкі, сабраныя ў суквецце кошык на прамастойных бязлістых кветаносах, чырв., ружовыя, белыя. Меданосныя, дэкар. расліны.

А.М.Скуратовіч.

СТАКУ́Н Міхаіл Восіпавіч (1893, в. Нідзяны Астравецкага р-на Гродзенскай вобл. — 27.4.1943), бел. парт. і дзярж. дзеяч. Скончыў курсы марксізму-ленінізму пры ЦК ВКП(б) (1931). Са студз. 1917 у арміі. Пасля Лют. рэвалюцыі 1917 адзін з арганізатараў Чырв. гвардыі, чл. выканкома Выбаргскага райсавета ў Петраградзе. З 1918 на гасп., з 1924 на парт. рабоце. Са студз. 1935 упаўнаважаны Наркамата харч. прам-сці СССР пры СНК БССР, з чэрв. 1935 1-ы сакратар Гомельскага гаркома КП(б)Б. З 7.7 па 13.11.1937 Старшыня ЦВК БССР. Чл. ЦК КП(б)Б у 1935—37, чл. Бюро ЦК у чэрв. — кастр. 1937. Чл. Прэзідыума ЦВК БССР у 1937. 25.10.1937 пленум ЦК КП(б)Б вывеў С. з чл. Бюро і чл. ЦК КП(б)Б, зняў з пасады Старшыні ЦВК БССР, і ён пры-



Панарама **Стакгольма**.



Стакротка шматгадовая.

цягнуты да крымін. адказнасці за «антысав. дзейнасць». 27—29.5.1940 Ваен. калегія Вярх. суда СССР вынесла яму апраўдальны прыгавор, аднак пленум Вярх. суда СССР 29.7.1943 адмяніў яго, а справа спынена ў сувязі са смерцю С. Рэабілітаваны ў 1954. *Я.С.Фалей.*

СТАЛАГМІ́ТЫ (ад грэч. stalagma кропля), нацечна-капежныя ўтварэнні ў выглядзе конусаў, слупоў, якія растуць з дна падземных пустот (карставых пячор, галерэй, старых горных вырабатак). Утвараюцца ад выпадзення ў асадак вапнавага рэчыва з кропель вады, якія капаюць зверху. Гл. таксама *Пячоры.*



Сталагміты.

СТАЛАГНА́ТЫ, сталактоны, вапнавыя нацечна-капежныя ўтварэнні ў выглядзе калон, якія фарміруюцца ў карставых пячорах пры зрастанні *сталактытаў* і *сталагмітаў.*

СТАЛАКТЫ́ТЫ (ад грэч. stalaktos які нацёк па кроплі), нацечна-капежныя ўтварэнні ў выглядзе ледзяшоў, трубак, конусаў, якія спускаюцца са столі і верхняй часткі сцен падземных пустот (карставых пячор, галерэй, старых горных вырабатак). Утвараюцца ад выпадзення ў асадак вапнавага рэчыва з кропляў вады, што прасочваюцца праз дробныя поры і шчыліны ў горныхародах. Трапляюцца таксама гіпсавыя і саляныя С., якія ўтвараюцца за кошт выпарэння. Гл. таксама *Пячоры.*



Сталактыты.

СТАЛБО́ЎСКІ МІР 1617, мірны дагавор паміж Расіяй і Швецыяй, які завяршыў рус.-швед. вайну 1610—17 (гл. «*Смута*»). Заключаны 9.3.1617 у в. Сталбова каля г. Ціхвін. Швецыя вяртала Расіі гарады Ноўгарад, Старая Руса, Порхаў, Ладага, Гдоў і інш., але пакідала за сабой г. Карэла з паветам і Іжорскую зямлю з гарадамі Капор'е, Арэшак, Ям, Івангорад. Такім чынам, Расія страчвала выхад да Балт. мора, рас. ўрад выплачваў Швецыі 20 тыс. руб. Бакі дамовіліся пра свабоду гандлю рас. і швед. купцоў на тэр. абедзвюх краін. Дзярж. мяжа, усталяваная С.м., захоўвалася да *Паўночнай вайны 1700—21.*

«СТАЛБЫ́», запаведнік у Краснаярскім краі (Расія), у адгор'ях Паўн. Саян



У запаведніку **«Сталбы»**. «Слуп» «Пёры».

(Куйсумскі хр.). Назва ад т. зв. «слупоў» — каля 80 груп гранітна-сіянітавых скал выш. да 1000 м пад г. Краснаярск. Засн. ў 1925 для аховы экасістэм горнай тайгі Усх. Сібіры. Пл. 47,2 тыс. га. Рэльеф моцна перасечаны. Глебы слабыя, падзолістыя. У расліннасці добра вызначана верт. пояснасць. Горная ч. (500—800 м) укрыта цемнахвойнай тайгой з піхты, ніжэй (200—500) — светлахвойныя лясы з хвоі і лістоўніцы; у рачных лагах — ельнікі, ялова-піхтавыя лясы, бярэзнікі і інш. У флоры каля 700 відаў, шмат рэдкіх і знікаючых. Фауна тыпова таежная: буры мядзведзь, рысь, расамаха, ліс, барсук, собаль, кабарга, марал, таксама каланок, гарнастай, выдра, андатра, казуля. У арнітафауне каля 150 відаў.

СТАЛЕПЛАВІ́ЛЬНЫ АГРЭГА́Т БЕСПЕРАПЫ́ННАГА ДЗЕ́ЯННЯ, доследна-прамысловы агрэгат для выплаўкі сталі, які працуе ў стацыянарным рэжыме (з бесперапыннай падачай шыхты і выпускам сталі). Бываюць рэактарнага (канвертарнага) тыпу, струменныя, жолабавыя, ванныя; з газавым ацяпленнем, электрапячныя і чыста кіслародныя (без дадатковага ацяплення).

СТАЛЕ́ТАЎ Аляксандр Рыгоравіч (10.8.1839, г. Уладзімір, Расія — 26.5.1896), расійскі фізік; адзін з першаадкрывальнікаў *фотаэфекту*; стваральнік першай у Расіі навук. школы фізікаў. Скончыў Маскоўскі ун-т (1860), дзе і працаваў з 1866 (з 1873 праф.). У 1862—66 удасканальваў адукацыю ў Гейдэльбергскім, Гётынгенскім і Парыжскім ун-тах. Навук. працы па электрамагнетызме, оптыцы, малекулярнай фізіцы, гісторыі і метадалогіі навукі. Атрымаў крывую намагнічанасці жалеза (1872), правёў сістэматычныя даследаванні знешняга фотаэфекту (1888—90), адкрыў першы закон фотаэфекту. Даследаваў эл. разрады ў газах, крытычны стан рэчыва і інш. Заснаваў першую ў Расіі фіз. лабараторыю (1874) і быў ініцыятарам стварэння фіз. ін-та пры Маскоўскім ун-це.

Тв.: Собр. соч. Т. 1—3. М.; Л., 1939—47; Избр. соч. М.; Л., 1950.

Літ.: Болховитинов В. Столетов. 3 изд. М., 1965; Голин Г.М., Филонович С.Р. Классики физической науки (с древнейших времен до начала XX в.). М., 1989. С. 538—547. *А.І.Болсун.*

СТА́ЛІН (сапр. Джугашвілі) Іосіф Вісарыёнавіч (21.12.1879, г. Горы, Грузія — 5.3.1953), савецкі паліт. і дзярж. дзеяч. Герой Сац. Працы (1939), Герой Сав. Саюза (1945), Генералісімус Сав. Саюза (1945). Вучыўся ў Тыфліскай духоўнай семінарыі (1894—99; выключаны за рэв. дзейнасць). Чл. РСДРП з 1898, бальшавік з 1903. У 1902—13 неаднаразова арыштаваны і сасланы ў Сібір. У 1907 адзін з арганізатараў і кіраўнікоў Бакінскага к-та РСДРП. Паплечнік У.І.*Леніна*. На VI (Пражскай) Усерас. канферэнцыі завочна кааптаваны ў ЦК і Рус. бюро ЦК РСДРП і рэдакцыю газ. «Правда». На VI з'ездзе РСДРП(б) чытаў справаздачны даклад ЦК, выбраны чл. вузкага складу ЦК, чл. Палітбюро ЦК для кіраўніцтва ўзбр. паўстаннем. Чл. Петраградскага ВРК у час Кастр. рэвалюцыі 1917. З ліст. 1917 чл. ВЦВК. У 1917—22 нарком па справах нацыянальнасцей, адначасова (1919—22) нарком дзярж. кантролю. У гады *грамадзянскай вайны і ваеннай інтэрвенцыі 1918—22* чл. РВС Рэспублікі, шэрагу франтоў і армій. У ліп.—жн. 1919 як чл. РВС Зах. фронту знаходзіўся на Беларусі ў раёне Барысава. У 1921 на X з'ездзе РКП(б) падтрымаў палітыку каранізацыі, адзначыў, што «існуе беларуская нацыянальнасць, у якой маецца свая мова, адметная ад рускай, з прычыны чаго падняць культуру беларускага народа можна толькі на яго роднай мове». У 1922 пры абмеркаванні пытання аб аб'яднанні сав. рэспублік прапанаваў «план аўтанамізацыі», згодна з якім усе сав. рэспублікі ўваходзілі ў склад РСФСР як аўтаномныя (быў прыняты ленінскі план стварэння СССР). У

1922—53 Ген. сакратар ЦК Камуніст. партыі. У канцы 1920—30-я г. ў ходзе барацьбы С. за лідэрства ў партыі і дзяржаве пачаў фарміраваць культ яго асобы. Пасля таго, як была згорнута *новая эканамічная палітыка*, праводзіў фарсіраваную *індустрыялізацыю* краіны і *калектывізацыю* сельскай гаспадаркі, у выніку чаго была створана эканам. і паліт. моцная дзяржава, здольная супрацьстаяць знешняй пагрозе; з эканам. мадэрнізацыяй краіны павысіўся ўзровень культуры і ў пэўнай ступені дабрабыт насельніцтва. С. імкнуўся звязаць тэорыю *марксізму* з дзярж. інтарэсамі краіны. Лічыў, што па меры будаўніцтва сацыялізму абвастраецца класавая барацьба, што служыла абгрунтаваннем *рэпрэсій палітычных*. У канцы 1930-х г. кі-



А.Р.**Сталетаў**.



І.В.**Сталін**.

раваў напружанай работай па ўмацаванні абараназдольнасці краіны, у складаных міжнар. умовах пайшоў на збліжэнне з Германіяй (гл. *Савецка-германскія пагадненні*). З 1941 старшыня Саўнаркома (з 1946 Савета Міністраў) СССР. Дапусціў пралік у ацэнцы моманту магчымага нападу Германіі на СССР, што мела цяжкія наступствы ў 1-я месяцы *Вялікай Айчыннай вайны 1941—45*; у далейшым паслядоўна кіраваў барацьбой супраць ворага. З 30.6.1941 старшыня Дзярж. к-та абароны СССР, з 19.7.1941 нарком абароны СССР, з 8.8.1941 Вярх. галоўнакаманд. Узбр. Сіламі СССР. Пад яго кіраўніцтвам здабыта перамога сав. народа над фаш. Германіяй і мілітарысцкай Японіяй. Па словах прэм'ер-міністра Вялікабрытаніі У.*Чэрчыля*, сказаных у 1959, «вялікім шчасцем было для Расіі, што ў гады найцяжэйшых выпрабаванняў краіну ўзначальваў геній і непахісны палкаводзец Сталін». Як кіраўнік Сав. ўрада С. быў адным з арганізатараў *антыгітлераўскай кааліцыі* ў час *другой сусветнай вайны 1939—45*, удзельнічаў у канферэнцыі кіраўнікоў урадаў ЗША, СССР і Вялікабрытаніі ў Тэгеране (1943), Ялце і Патсдаме (1945). У пасляваен. перыяд пад кіраўніцтвам С. праводзілася хуткае аднаўленне разбуранай нар. гаспадаркі, ва ўмовах пагаршэння адносін з ЗША і Вялікабрытаніяй (гл. *«Халодная вайна»*) была створана ўласная атамная зброя (1949). Пахаваны на Краснай Плошчы ў Маскве.

Асуджэнне *культу асобы* С. і яго палітыкі адбылося на XX (1956) і XXII (1961) з'ездах КПСС. Ацэнкі ролі С. ў гісторыі Сав. дзяржавы і Камуніст. партыі палярныя, часта з'яўляюцца прадметам паліт. дыскусій.

Тв.: Соч. Т. 1—13. М., 1949—51. Т. 14—16, 1995—97; Бел. пер. — Творы. Т. 1—13. Мн., 1950—55.

Літ.: О преодолении культа личности и его последствий: Постановление ЦК КПСС от 30 июня 1956 г. // КПСС в резолюциях и решениях... 8 изд. М., 1971. Т. 7; Ленін У.І. Пісьмо да з'езда // Тв. Т. 36 (Полн. собр. соч. Т. 45); Васецкий Н. Сталин: борьба за лидерство в партии // Страницы истории КПСС: Факты. Проблемы. Уроки. М., 1988; Историки спорят: Тринадцать бесед. М., 1988; Волкогонов Д.А. Сталин. Кн. 1—2. М., 1999; Режим личной власти Сталина: К истории формирования. М., 1989; Белади Л., Краус Т. Сталин: Пер. с венг. М., 1989; Зевелев А.И. Истоки сталинизма: Лекция... М., 1990; История и сталинизм. М., 1991; Такер Р. Сталин: Путь к власти, 1879—1929: История и личность: Пер. с англ. М., 1991; Яго ж. Сталин у власти. 1928—1941. История и личность: Пер. с англ. М., 1997; Божанов В.А. Восхождение к абсолютной власти (большевики и советское государство в 20-е гг.). Мн., 1995; Яковлев Н.Н. Сталин: путь наверх. М., 2000.

У.А.Бажанаў.

А таксама: Макаренко В.П. Бюрократия и сталинизм. Ростов н/Д, 1989; Сласcер Р. Сталин в 1917 г.: Человек, оставшийся вне революции: Пер. с англ. М., 1989; Соловьев Б.Г., Суходеев В.П. Полководец Сталин. М., 2001; Залесский А.И. И.В.Сталин и коварство его политических противников. Кн. 1. Мн., 1999; Холловэй Д. Сталин и бомба. Советский Союз и атомная энергия. 1939—1956: Пер. с англ. Новосибирск, 1997; Кожинов В.В. Россия. Век XX. 1901—1939. М., 1999; Яго ж. Россия. Век XX. 1939—1964. М., 1999; Иванов Р.Ф. Сталин и союзники. 1941—1945 гг. Смоленск, 2000; Липартелиани Г. Сталин Великий. Частные попытки исследования личности И.В.Сталина. Изд. 2. СПб., 2001; Островский А. Кто стоял за спиной Сталина? СПб., 2002; Медведев Ж.А., Медведев Р.А. Неизвестный Сталин. М., Харьков, 2002.

СТАЛІНГРА́ДСКАЯ БІ́ТВА 1942—43, адна з найбуйнейшых бітваў 2-й сусв. і Вял. Айч. войнаў. Складалася з абарончай (17.7—18.11.1942) і наступальнай (19.11.1942 — 2.2.1943) аперацый сав. войск. Паражэнні пад Харкавам і ў Данбасе прывялі да часовай страты сав. войскамі стратэг. ініцыятывы, стварылі пагрозу захопу ворагам Сталінграда і Паўн. Каўказа. Для наступлення на Сталінград ням. камандаванне вылучыла 6-ю палявую і 4-ю танк. арміі. З мэтай арганізацыі больш эфектыўнай стратэг. абароны Стаўка Вярх. Галоўнакамандавання 12 ліп. стварыла Сталінградскі фронт (камандуючы Маршал Сав. Саюза С.К.*Цімашэнка*, з 23 ліп. ген.-лейт. В.М.Гордаў, з 13 жн. ген.-палк. А.І.*Яроменка*). Абарончая аперацыя пачалася сутыкненнем 17 ліп. ў раёне р. Чыр часцей 62-й сав. арміі (камандуючы ген.-м. У.Я.Калпакчы) і 6-й ням. арміі (камандуючы ген.-палк., са студз. 1943 ген.-фельдмаршал Ф.*Паўлюс*). Маючы перавагу ў сілах і сродках, праціўнік 23 ліп. прарваў абарону сав. войск, акружыў 3 дывізіі і інш. часці і выйшаў да р. Дон. Каб спыніць наступленне ворага, Стаўка Вярх. Галоўнакамандавання прыняла шэраг захадаў (28.7.1942 І.В.*Сталін* падпісаў загад № 227, які ўвайшоў у гісторыю пад назвай «ні кроку назад»). 7 жн. Сталінградскі фронт, працягласць якога дасягала 800 км, падзелены на 2 часткі: Сталінградскі фронт, які з 28 вер. называўся Данскім фронтам, і Паўд.-Усх. фронт (з 28 вер. атрымаў ранейшую назву Сталінградскі фронт), асн. задачай якога стала абарона Сталінграда. Прадстаўнікамі Стаўкі на франтах Сталінградскага напрамку прызначаны (23 ліп. А.М.*Васілеўскі*, 26 жн. Г.К.*Жукаў*). Ням. камандаванне таксама ўзмацніла групоўку, што наступала на Сталінград: 31 ліп.





Да арт. **Сталінградская бітва 1942—43**. Баі на вуліцах Сталінграда. Восень 1942.

з Каўказскага напрамку сюды павернута 4-я танк. армія. 19 жн. герм. войскі адначасовымі ўдарамі з З і Пд пачалі новае наступленне. У выніку сав. фронт быў прарваны, да 23 жн. ням. танк. злучэнні дасягнулі р. Волга і пачалі штурм горада. Сталінград абаранялі войскі 62-й (ген.-лейт. В.І.*Чуйкоў*), часткова 64-й (ген.-лейт. М.С.Шумілаў) армій. У вер. напружаныя баі ішлі на вуліцах горада, з 4 кастр. — у цэхах заводаў.

У кастр. — ліст. 1942 Стаўка Вярх. Галоўнакамандавання і Ген. штаб разам з камандаваннем франтоў распрацавалі план аперацыі па акружэнні і знішчэнні групоўкі ворага ў раёне Сталінграда (кодавая назва «Уран»). 19 ліст. пасля артыл. падрыхтоўкі войскі Паўд.-Зах. (ген.-лейт., з 7 снеж. ген.-палк. М.Ф.*Ватуцін*) і правага крыла Данскога (ген.-лейт., з 15 студз. 1943 ген.-палк. К.К.*Ракасоўскі*) франтоў прарвалі абарону праціўніка на ПнЗ ад Сталінграда. 20 ліст. з раёна на Пд ад горада насустрач войскам Паўд.-Зах. фронту нанеслі ўдар войскі Сталінградскага (ген.-палк. А.І.Яроменка) і 23 ліст. замкнулі кальцо акружэння (у «кацёл» трапілі 6-я і 4-я ням. арміі, значная колькасць спец. і дапаможных часцей і падраздзяленняў — усяго каля 330 тыс. чал.). 16 снеж. сав. войскі разгарнулі наступленне на Сярэднім Доне. Да канца месяца Паўд.-Зах. і левае крыло Варонежскага (ген.-лейт. П.І.*Голікаў*) франтоў разгромілі асн. сілы 8-й італьян. арміі, ням. аператыўнай групы «Холіт», рэшткі 3-й рум. арміі і стварылі ўмовы для поўнай ліквідацыі акружанай пад Сталінградам групоўкі ням. войск. Спроба забеспячэння акружаных войск з дапамогай авіяцыі была сарвана (знішчана больш за 700 самалётаў ворага). Калі праціўнік адхіліў прапановы аб капітуляцыі, войскі Данскога фронту 10.1.1943 перайшлі ў наступленне (кодавая назва «Кальцо»). У выніку злучэння войск 21-й і 62-й сав. армій каля Мамаева кургана 26 студз. варожая групоўка была рассечана на 2 часткі. 31 студз. спыніла супраціўленне паўд. група ням. войск (ген.-фельдмаршал Ф.Паўлюс), 2 лют. капітулявала паўн. група (ген. Штрэкер). У выніку С.б. разгромлена больш за 100 дывізій праціўніка, яго войскі страцілі каля 1,5 млн. чал., 3,5 тыс. танкаў (з улікам войск і тэхнікі саюзнікаў фаш. Германіі). Страты сав. войск па некат. звестках дасягнулі 1,1 млн. чал. Сярод удзельнікаў С.б. былі тысячы беларусаў і ўраджэнцаў Беларусі, у т.л. нам. каманд. Сталінградскім фронтам К.А.*Каваленка*, камандуючыя: 17-й паветр. арміяй С.А.*Красоўскі*, 5-й танк. арміяй А.І.*Лізюкоў* (загінуў 25.7.1942), 62-й арміяй А.І.*Лапацін*, нач. штаба 21-й арміі В.А.*Пянькоўскі*, а таксама камандаванне Волжскай ваен. флатыліі (П.А.Трайнін, П.Ц.Бандарэнка, А.І.Цыбульскі). Многія беларусы здзейснілі подзвіг: камісар палка М.П. *Сыдзько*, камандзір гарматы кананерскай лодкі А.А.Кандраценка, лётчык І.Я.*Сяржантаў*, А.Я.*Вашчанка*, А.К.*Стампікоўская* і інш. У час. С.б. партызаны і падпольшчыкі ўзмацнілі ўдары па варожых тылах: зрывалі перакідку да месца баёў рэзерваў, знішчалі эшалоны з жывой сілай і тэхнікай (у 2-й пал. 1942 бел. партызаны штомесяц узрывалі 150 — 160 эшалонаў). У сувязі з катастрафічным паражэннем пад Сталінградам у Германіі была аб'яўлена 3-дзённая жалоба. Перамога у С.б. стала пачаткам карэннага пералому ў ходзе Вял. Айч. вайны і ўсёй 2-й сусв. вайны: створаны ўмовы для разгортвання агульнага зімовага наступлення 1942—43 ад Ленінграда да Паўн. Каўказа і выгнання акупантаў з





тэр. СССР. Праціўнік страціў стратэг. ініцыятыву і не вярнуў яе да канца вайны. Паражэнне пад Сталінградам абвастрыла ўнутрыпаліт. становішча Германіі і яе сатэлітаў, у той жа час садзейнічала кансалідацыі антыгітлераўскай кааліцыі. У снеж. 1942 Прэзідыум Вярх. Савета СССР зацвердзіў медаль «За абарону Сталінграда», які атрымалі больш за 700 тыс. удзельнікаў бітвы, 112 воінаў сталі Героямі Сав. Саюза. Подзвіг герояў-сталінградцаў увекавечаны ў помнікуансамблі героям С.б. на Мамаевым кургане. У загадзе Вярх. Галоўнакамандуючага ад 1.5.1945 г. Сталінград у ліку першых названы горадам-героем (палажэнне аб званні горад-герой зацверджана 8.5.1965).



Да арт. **Сталінградская бітва 1942—43**. На абарону Сталінграда. Мастак А.Буднікаў.

Літ.: История второй мировой войны, 1939—1945. Т. 5—6. М., 1975—76; Самсонов А.М. Вторая мировая война, 1939—1945: Очерк важнейших событий. 4 изд. М., 1990; Василевский А.М. Победа в битве на Волге // Василевский А.М. Дело всей жизни. Мн., 1988; Жуков Г.К.Стратегическое поражение противника в районе Сталинграда // Жуков Г.К. Воспоминания и размышления. 3 изд. М., 1978. Т. 2; Яковлев Н.Н. 19 ноября 1942. 2 изд. М., 1979; Видер И. Катастрофа на Волге: Пер. с нем. М., 1965; Мировая война: Взгляд побежденных, 1939—1945 гг. М.; СПб., 2002; Адам В. Катастрофа на Волге: Мемуары адъютанта Ф.Паулюса: Пер. с нем. Смоленск, 2001; Литвин Г. Русская Хиросима: Сталинград. Август 1942 г. // Авиация и космонавтика. 1998. № 8.

М.Я.Казырэвіч, У.І.Лемяшонак, Р.Ч.Лянькевіч.

СТАЛІ́ЦА, галоўны горад дзяржавы, адм.-паліт. цэнтр краіны. С. звычайна з'яўляецца месцазнаходжаннем вышэйшых органаў дзярж. улады і дзярж. кіравання, вышэйшых суд., ваен. і інш. устаноў. У большасці выпадкаў С. — таксама эканам. цэнтр краіны (як напр., *Мінск* у Беларусі), але ў некат. краінах эканам. цэнтрам з'яўляецца іншы горад (напр., сталіца ЗША — г. *Вашынгтон*, а эканам. цэнтр — г. *Нью-Йорк*). Як правіла, С. вылучаюцца ў самаст. адм. адзінку з асобым рэжымам кіравання. Акрамя С., якія набылі гэты статус у працэсе гіст. развіцця, існуюць гарады, якія спецыяльна пабудаваны для выканання сталічных функцый (*Канберра*, Аўстралія; *Бразілія*, Бразілія; *Ісламабад*, Пакістан і інш.). У некат. краінах пры існаванні афіц. С. фактычна сталічныя функцыі выконваюць інш. гарады (у Балівіі *Ла-Пас* замест *Сукрэ*, у Нідэрландах *Гаага* замест *Амстэрдама*). У *Расійскай імперыі* з пераносам сталіцы (1712) у *Санкт-Пецярбург* некат. сталічныя функцыі захоўваліся за ранейшай сталіцай — г. *Масква*.

СТАЛІ́ЦА, вёска ў Германавіцкім с/с Шаркаўшчынскага р-на Віцебскай вобл., на правым беразе р. Дзісна. Цэнтр калгаса. За 26 км на ПнУ ад г.п. і чыг. ст. Шаркаўшчына, 244 км ад Віцебска. 322 ж., 123 двары (2001). Базавая школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

СТАЛО́ВАЯ ГАРА́ (лац. Mensa), каляпалярнае сузор'е Паўд. паўшар'я неба. Найб. яркія зоркі 4,0 візуальнай *зорнай велічыні*. Гл. *Зорнае неба*.

СТАЛО́ВІЦКАЯ БІ́ТВА 1771. Адбылася 23.9.1771 каля мяст. *Сталовічы* паміж войскамі ВКЛ і Расіі ў час барацьбы *Барскай канфедэрацыі* супраць прысутнасці рас. войск у Рэчы Паспалітай. Вял. гетман ВКЛ М.К.*Агінскі* ў маі 1771 сабраў пад сваё камандаванне 2 тыс. чал. войска ВКЛ. 6.9.1771 каля в. Рудзькі Пінскай эканоміі ён разбіў рас. батальён з 500 салдат палкоўніка А.Албічава. 10.9.1771 у мяст. Хомск заклікаў разрозненыя сілы канфедэратаў аб'яднацца для абароны «веры, вольнасці і незалежнасці». Ліквідаваць гэты ачаг супраціўлення ўзяўся ген.-маёр А.В.Суворaў, які 12.9.1771 выступіў з-пад Любліна на чале 1 тыс. салдат з 8 гарматамі. Каля 2 гадз ночы 23.9.1771 атрад Суворава напаў на атрады Агінскага. У ходзе 8-гадзіннага бою Агінскі страціў 500 чал. забітымі і каля 300 палоннымі. Пасля паражэння ў бітве Агінскі выехаў за мяжу. С.б. стала апошнім арганізаваным супраціўленнем войска ВКЛ напярэдадні *першага падзелу Рэчы Паспалітай*.

Я.К.Анішчанка.

СТАЛО́ВІЦКІ КАСЦЁЛ ІАА́НА ХРЫСЦІ́ЦЕЛЯ, помнік архітэктуры стылю віленскага барока ў в. Сталовічы Баранавіцкага р-на Брэсцкай вобл. Пабудаваны ў 1740—46 (арх. І.Фантана III, І.К.Глаўбіц) па фундацыі пазнанскага камандора С.Дамброўскага. У 1863—66 перабудаваны пад правасл. Успенскую царкву.

У 1610 кн. М.К.Радзівіл Сіротка засн. у Сталовічах камандорыю кавалераў Мальтыйскага ордэна; пабудаваў драўляны касцёл св. Марыі і Іаана Хрысціцеля (не захаваўся), дзе размясціў прывезеную з Італіі скульптуру Маці Божай Латэранскай. У 1637—39 манахі ордэна збудавалі прамавугольную ў плане невял. мураваную капліцу, якую назвалі Латэранскай у гонар прывезенай святыні. У 1660-я г. камандорамі былі Т. і М.Юдзіцкія.

Сучасны храм (на месцы драўлянага) — мураваная 3-нефавая 2-вежавая базіліка з больш нізкімі прэсбітэрыем і бакавымі сакрыстыямі; па падоўжнай восі да яго прылягае капліца. Гал. фасад вылучаны цэнтр. рэзалітам, які ўтварае 3 праслы; падзелены карнізамі на 3 ярусы, аздоблены слаістымі пілястрамі. Уваход фланкіруюць 4 паўкалоны. Высокія аконныя праёмы з паўцыркульнымі завяршэннямі аздоблены ляпнымі абрамленнямі. Пасля перабудовы ўзведзены драўлянае 5-купалле і званіца з пазалочанымі крыжамі ў франтоннай ч. над прэсбітэрыем і апсідай; бакавыя 3-ярусныя вежы былі зняты (адлюстраваны на фотаздымку пач. 20 ст.). Дэкар. аздабленне інтэр'ера выканана са стука (паводле праекта арх. Глаўбіца). Галоўны алтар 3-ярусны з 2-яруснай каланадай і ляпной кампазіцыяй «Глорыя» ў завяршэнні, у бакавых нефах былі 2-ярусныя ляпныя алтары (не захаваліся). У



Сталовіцкі касцёл Іаана Хрысціцеля. Сучасная Успенская царква.

інтэр'ер у якасці прэсбітэрыя ўключана Ларэтанская капліца. Пры перабудове ўстаноўлены драўляны іканастас. За апсідай створаны прыдзельны храм, звязаны з малітоўнай залай бакавымі праходамі.

А.М.Кулагін, Т.І.Чарняўская, М.М.Яніцкая.

СТАЛО́ВІЦКІ КАСЦЁЛ СЭ́РЦА ІСУ́СА, помнік архітэктуры неаготыкі ў в. Сталовічы Баранавіцкага р-на Брэсцкай вобл. Пабудаваны ў 1907—11 з цэглы. 3-нефавая 1-вежавая базіліка. Прамавугольны ў плане будынак, накрыты 2-схільным дахам, расчлянёным дахавымі аконнымі праёмамі, з фіяламі ў завяршэнні. Дамінантай з'яўляецца 2-ярусная званіца (васьмярык на чацверыку) з высокім шпілем. Фасады рытмічна расчлянёны стральчатымі праёмамі і контрфорсамі ў прасценках і па бакох будынка. Гал. ўваход вырашаны моцным перспектыўным парталам і фланкіраваны 3-ступеньчатымі контрфорсамі, увянчанымі высокімі шатрамі з крабамі. Падобныя завяршэнні маюць вуглавыя фіялы алтарнага шчыта. Арх.-маст. выразнасць будынка дасягаецца багаццем краповак, профіляў і абломаў, выкананых сродкамі муроўкі, насычаным каларыстычным вырашэннем. *А.М.Кулагін.*



Сталовіцкі касцёл Сэрца Ісуса.

СТАЛО́ВІЧЫ, Сталавічы, вёска ў Баранавіцкім р-не Брэсцкай вобл., каля р. Смалянка, на аўтадарозе Гарадзішча—Баранавічы. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 12 км на Пн ад горада і чыг. ст. Баранавічы, 210 км ад Брэста. 671 ж., 289 двароў (2001). Сярэдняя школа, б-ка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Брацкая магіла партызан. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Помнікі архітэктуры: Свята-Успенская царква (былы *Сталовіцкі касцёл Іаана Хрысціцеля*), *Сталовіцкі касцёл Сэрца Ісуса*.

Вядома з 14 ст. З 16 ст. мястэчка ў Навагрудскім пав., належала Радзівілам. У пач. 17 ст. М.К.Радзівіл Сіротка засн. Сталовіцкую камандорыю Мальтыйскага ордэна ў складзе маёнткаў С. і Пацейкі для свайго сына мальтыйскага рыцара Ж.К.Радзівіла. У 1640—46 у С. пабудаваны Сталовіцкі касцёл Іаана Хрысціцеля. У *Сталовіцкай бітве 1771* армія А.В.Суворава разбіла каля С. войска М.К.Агінскага. Пасля 3-га падзелу Рэчы Паспалітай (1795) С. ў складзе Рас. імперыі, мястэчка, цэнтр воласці Навагрудскага пав. Слонімскай, з 1797 Літоўскай, з 1801 Гродзенскай, з 1842 Мінскай губ. У 1897 — 929 ж., у 1909 — 858 ж., 95 двароў, школа, 2 царквы, касцёл, яўрэйскі малітоўны дом, 2 кірмашы на год. У 1907—11 пабудаваны *Сталовіцкі касцёл Сэрца Ісуса*. У 1921 — 39 у складзе Польшчы, мястэчка, цэнтр гміны Баранавіцкага пав. Навагрудскага ваяв., 678 ж. (1921). З 1939 у складзе БССР, вёска, з 1940 цэнтр сельсавета Гарадзішчанскага р-на Баранавіцкай вобл., з 1954 — Брэсцкай вобл., з 1962 — Баранавіцкага р-на. *А.І.Валаханоўіч.*

СТАЛО́ВЫЯ ГО́РЫ, ізаляваныя ўзвышшы са стромкімі схіламі і плоскімі паверхнямі вяршынь. Складзены звычайна з устойлівых да разбурэння горных парод (вапнякі, трапы, пясчанікі), якія залягаюць гарызантальна або амаль гарызантальна; у тропіках С.г. бываюць пакрытыя ахоўнай латэрытнай скарынкай. Утвараюцца пры эразійным расчляненні або дыферэнцыраваным перамяшчэнні па разломах блокаў высокапрыўзнятых пластавых раўнін (сталовых краін). Трапляюцца таксама ў выглядзе адзіночных ізаляваных падняццяў — астраўных гор.

СТАЛО́Н [ад лац. stolo (stolonis) каранёвы парастак], відазменены парастак з доўгімі тонкімі міжвузеллямі і лускападобным, бясколерным, радзей зялёным лісцем. У адрозненне ад карэнішчаў С. недаўгавечныя, служаць для вегетатыўнага размнажэння і рассялення. Падземныя С. звычайна маюць клубні або цыбуліны (бульба, семачок); надземныя — т.зв. вусы (казялец паўзучы, касцяніцы, суніцы).

СТАЛО́НЕ (Stallone) Сілвестэр (н. 6.7.1946, Нью-Йорк, ЗША), амерыканскі кінаакцёр, рэжысёр, сцэнарыст. Атрымаў вядомасць як акцёр і сцэнарыст у меладрамах-баевіках пра баксёра «Рокі» (1976—90; і рэжысёр у 2—4-й серыях), у 3 стужках пра супермена Рэмба (1982—88). Зняўся ў фільмах «F.I.S.T.», «Кобра», «Танга і Кэш», «Оскар», «Скалалаз» і інш. Паставіў муз. фільм «Застаючыся жывым» (1983).

СТАЛЫ́ПІН Пётр Аркадзевіч (14.4.1862, г. Дрэздэн, Германія — 18.9.1911), расійскі дзярж. дзеяч. Буйны памешчык. Скончыў Пецярб. ун-т (1884), служыў у мін-вах унутр. спраў і дзярж. маёмасцей. З 1899 пав., потым губ. маршалак ковенскага дваранства, у чэрв. 1902 — сак. 1903 гродзенскі губернатар. Па яго ініцыятыве ў Гродне адчынены рамеснае, жаночае прыходскае, яўр. двухкласнае вучылішчы, рабіў захады па паляпшэнні ўмоў для развіцця сельскай гаспадаркі губерні. З сак. 1903 да крас. 1906 губернатар Саратаўскай губ., дзе задушыў сял. рух. З крас. 1906 міністр унутр. спраў, адначасова з ліп. і старшыня Савета Міністраў. Прыхільнік і актыўны праваднік рэпрэсій (ваен.-палявыя суды, прымяненне смяротнай кары і інш.) у барацьбе з рэвалюцыяй па-



П.А.Сталыпін.



Сталовыя горы ў басейне р. Каларада.

водле прынцыпу: «спачатку заспакаенне, а потым рэформы». Урад С. 16.6.1907 распусціў 2-ю Дзярж. думу і выдаў дыскрымінацыйны у адносінах да прац. мас новы выбарчы закон, у выніку чаго ўсталявалася *«трэцячэрвеньская манархія»*. С. спрыяў выданню закона ад 18.10.1906 аб ануляванні некат. абмежаванняў сял. правоў (канчаткова адменены падушны падатак і кругавая парука, ліквідаваны некат. абмежаванні ў перамяшчэнні сялян і г.д.). Правёў агр. рэформу (гл. *Сталыпінская аграрная рэформа*), накіраваную на фарміраванне значнага слоя заможнага сялянства і сял. буржуазіі, развіццё капіталізму ў сельскай гаспадарцы. Але глыбокія сац.-эканам. супярэчнасці ў краіне, абвастраныя самой агр. рэформай, абумовілі няўдачу палітыкі С. 14.9.1911 смяротна паранены агентам ахранкі эсэрам Дз.Р.Багровым.

Літ.: Столыпин: Жизнь и смерть: Сб. публицистики. Саратов, 1991; Рыбас С.Ю., Тараканова Л.В. Реформатор: Жизнь и смерть Петра Столыпина. М., 1991; Бок М.П. П.А. Столыпин: Воспоминания о моем отце. М., 1992; Зырянов П.Н. Петр Столыпин: Полит. портрет. М., 1992; Хотулев В.В. Петр Столыпин. М.; Смоленск, 1998; Федоров Б.Г. Петр Столыпин: «Я верю в Россию». Биография П.А. Столыпина. Т. 1—2. СПб., 2002. *В.П.Панюціч.*

СТАЛЫ́ПІНСКАЯ АГРА́РНАЯ РЭФО́РМА, буржуазная рэформа сял. *надзельнага землеўладання* ў Рас. імперыі, у т.л. на Беларусі, у 1906—17. Названа па прозвішчы П.А.*Сталыпіна*, ініцыятара і кіраўніка рэформы. Выклікана развіццём капіталізму, барацьбой сялян за ліквідацыю панскага землеўладання і інш. рэшткаў прыгонніцтва ў час рэвалюцыі 1905—07. С.а.р. праводзілася з мэтай захавання манархіі, стварэння больш спрыяльных умоў для развіцця капіталіст. адносін у с.-г. вытв-сці, умацавання слоя сял. буржуазіі і заможнага сялянства ў якасці апоры самадзяржаўя, ператварэння асн. масы сялян у парабкаў і прамысл. рабочых, паскарэння росту прадукц. сіл земляробства пры захаванні памешчыцкіх *латыфундый* і прадухілення агр.-сял. рэвалюцыі. Гал. змест рэформы: разбурэнне сельскай пазямельнай *абшчыны*, насаджэнне дробнакапіталіст. сял. зямельнай уласнасці і хутарской формы землекарыстання, перасяленне беззямельных і малазямельных сялян у Сібір, на Д. Усход, у Казахстан і інш. ўскраінныя рэгіёны імперыі. Пачалася паводле ўказа ад 22.11.1906, які дазваляў выхад сялян з пазямельнай абшчыны і замацаванне за імі зямлі ў асабістую ўласнасць. Указ з некат. папраўкамі ўхвалены Дзярж. Саветам, зацверджаны царом і прыняты Дзярж. думай як Закон 27.6.1910, дапоўнены палажэннем аб землеўпарадкаванні ад 11.6.1911, якое ўсталёўвала прымусовы выхад сялян з абшчыны і пераход да спадчыннага падворнага землеўладання.

У 1905 абшчыннае землеўладанне ахоплівала 77,1% сял. двароў і 83,2% надзельных зямель Еўрап. Расіі. На Беларусі яно не мела значнага пашырэння і захавалася пераважна ў Магілёўскай (80,5% сял. двароў, 79,3% надзельнай зямлі) і Віцебскай (53% сял. двароў, 44,6% надзельнай зямлі) губ. Падворнае ўладанне ворнымі землямі і сенажацямі панавала ў Прыбалтыцы, Зах. і Цэнтр. Беларусі, на Правабярэжнай Украіне. Нягледзячы на адм. націск улад, на пач. 1916 з пазямельнай абшчыны выйшла толькі 26% сял. двароў, на долю якіх прыпадала 14,7% сял. абшчыннага землеўладання. Найб. актыўны выхад з абшчыны назіраўся на Пд Украіны і ў Стэпавым Заволжы — у рэгіёнах адносна высокага ўзроўню развіцця агр. капіталізму. Значным быў выхад з абшчыны і на У Беларусі. Да 1916 у Магілёўскай і Віцебскай губ. з яе выйшла 139,4 тыс. сял. двароў, (63% іх агульнай колькасці). Найменш закрануты рэфармаваннем Земляробчы цэнтр, паўн.-ўсх. і паўн. губерні. Землеўпарадкаванне, якое праводзілася ў ходзе С.а.р., найперш было накіравана на стварэнне *хутароў* і адрубоў (гл. *Водруб*) на сял. надзельнай зямлі. Аднак спадзяванні ўрада на масавае ўтварэнне хутарскіх і адрубных гаспадарак як апорнай базы «моцнага» сялянства не апраўдаліся. У еўрап. частцы імперыі яны ў 1907—16 складалі толькі 13,6% усіх надзельных двароў, на долю якіх прыпадала 12,2% надзельнага землеўладання. На надзельнай зямлі ў Віцебскай, Магілёўскай, Мінскай, Гродзенскай, Віленскай губ. за гэты час створана 113,8 тыс. хутарскіх і адрубных гаспадарак пл. 1147,2 тыс. дзес. (10% сял. двароў і 18,7% надзельнага землеўладання). Апрача таго, Сял. пазямельны банк прадаў пад хутары і адрубы ў гэтых губернях у 1907—16 228,7 тыс. дзес. банкаўскіх зямель, на якіх узнікла 13,5 тыс. гаспадарак. На купленай сялянамі казённай зямлі (5,4 тыс. дзес.) створана 813 хутарскіх і адрубных гаспадарак. Па адноснай колькасці хутароў і адрубоў, створаных пры выдзелах з абшчыны асобных гаспадароў дамоў, Беларусь стаяла на перадапошнім месцы сярод рэгіёнаў еўрап. часткі імперыі. Пры ўсіх намаганнях урада ў 5 зах. губернях на хутары і адрубы выйшла толькі $^1/_8$ сял. двароў. На хутары і адрубы ішлі гал. чынам кулакі і сял. бедната. Адным з элементаў С.а.р. было заахвочванне ўрадам сял. *перасяленства*. У 1906—16 з еўрап. часткі краіны ў Сібір і на Д. Усход перасялілася 3134,8 тыс. чал., у т.л. з 5 зах. губерняў — 335,4 тыс. чал. (11,6% перасяленцаў з еўрап. часткі імперыі). З іх 240,8 тыс. (71,8%) прыпадала на Магілёўскую і Віцебскую губ. З 1910, калі ў сялянства з'явіліся надзеі на атрыманне панскай зямлі, перасяленні рэзка скараціліся. Асн. катэгорыю перасяленцаў складала сял. бедната. Царская адміністрацыя не змагла належным чынам арганізаваць перасяленчую справу, аказаць істотную грашовую дапамогу перасяленцам. У выніку значная частка іх вымушана была вяртацца ў родныя мясціны. У 1907—14 з Сібіры і Д. Усходу вярнулася 546,6 тыс. (17,4%) перасяленцаў, у т.л. ў 5 зах. губерняў — 36,5 тыс. (10,9%). Перасяленчая палітыка царызму не дасягнула мэты.

С.а.р. садзейнічала абеззямеленню бяднейшых слаёў сялян (якія былі вымушаны прадаваць кулакам атрыманыя ва ўласнасць землі) і канцэнтрацыі зямельнай уласнасці ў руках сял. буржуазіі. Адносна адсталая рас. прам-сць не магла прыняць у якасці рабочай сілы масу малазямельнага і беззямельнага сялянства, што захоўвала і ўзмацняла высокі ўзровень сац. напружанасці ў вёсцы. У эканам. плане С.а.р. мела прагрэсіўнае значэнне, бо паскарала рост капіталізму ў вёсцы, стварала новыя магчымасці для ўздыму с.-г. вытв-сці; расла прадукцыйнасць працы, развівалася гандл. земляробства. З выхадам на хутары і адрубы зменшыліся *цераспалосіца*, дробнапалосіца і далёказямелле сял. палёў, што садзейнічала развіццю сял. гаспадаркі. Аднак рэформа не прывяла да карэнных сац.-эканам. зрухаў, не вырашыла агр. пытання і не змагла прадухіліць наспяванне новай рас. бурж.-дэмакр. рэвалюцыі. Абсалютная большасць сял. гаспадарак не мела магчымасці карыстацца агранамічнай і тэхн. дапамогай, каап. крэдытам і інш. С.а.р. пацярпела няўдачу, бо праводзілася пры захаванні ўлады памешчыкаў, панскіх латыфундый, за кошт згалення сял. мас. Афіцыйна яна спынена пастановай Часовага ўрада ад 28.6(11.7).1917.

Літ.: Дубровский С.М. Столыпинская земельная реформа. М., 1963; Липинский Л.П. Столыпинская аграрная реформа в Белоруссии. Мн., 1978; Аврех А.Я. П.А.Столыпин и судьбы реформ в России. М., 1991; Зайцева Л.И. Аграрная реформа П.А. Столыпина в документах и публикациях конца XIX — начала XX в. М., 1995; Теляк Л.В. Столыпинская аграрная реформа: Историогр. (1906—1917 гг.). Самара, 1995. Тюкавкин В.Г. Великорусское крестьянство и Столыпинская аграрная реформа. М., 2001. *В.П.Панюціч.*

СТАЛЬ (польск. stal ад ням. Stahl), дэфармавальны (коўкі) сплаў жалеза з вугляродам (ад 0,025 да 2,14%) і інш. элементамі; від *жалезавугляродзістых сплаваў*; найважнейшы прадукт *металургіі*. Атрымліваюць гал. чынам з вадкага *чыгуну*, які выплаўляецца ў *доменных печах*, і стальнога лому (гл. *Металургічная прамысловасць*, *Чорная металургія*). Асн. агрэгаты для вытв-сці С.: *канвертары* (у іх атрымліваюць канвертарную С.), *мартэнаўскія печы* (мартэнаўскую С.) і *электрычныя печы* (электрасталь).

У залежнасці ад тыпу футроўкі печаў адрозніваюць асноўную і кіслую С.; ад характару застывання металу ў зложніцы — спакойную, паўспакойную і кіпячую С.; ад хім. саставу — *вугляродзістую сталь* і *легіраваную сталь*. Паводле прызначэння С. падзяляюцца на канструкцыйныя (напр., *высокатрывалая сталь*), *інструментальныя сталі*, С. з асаблівымі фіз. і хім. ўласцівасцямі (кіслатэстойлівая, *нержавейная сталь*, *электратэхнічная сталь*, гарачатрывалая і гарачаўстойлівая; гл.

ў арт. *Гарачатрывалыя матэрыялы*, *Гарачаўстойлівыя матэрыялы*). Уласцівасці С. паляпшаюць *легіраваннем*, *мадыфікаваннем* і *тэрмічнай апрацоўкай*. Выкарыстоўваюць С. у літым і дэфармаваным выглядзе.

У стараж. часы С. рабілі аднаўленнем жалеза з руд драўняным вуглем у *горнах* (гл. *Сыродутны працэс*). Літую С. атрымлівалі *тыгельнай плаўкай*, якая давала высокую якасць, але была малапрадукцыйная. Плаўленнем у вогнетрывалых тыглях атрымлівалі, у прыватнасці, *булат* і яго разнавіднасць — *дамаскую сталь*. У 14 ст. ўзнік крычны перадзел, які заключаўся ў рафінаванні папярэдне атрыманага чыгуну ў т.зв. крычным горне. У канцы 18 ст. пачалі выкарыстоўваць пудлінгаванне, пры якім у *полымных печах* расплаўленнем чыгуну і перамешваннем яго з жалезістымі шлакамі атрымлівалі малавугляродзістае жалеза (шчастападобны метал — крыцу). У 2-й пал. 19 ст. пудлінгаванне выцеснена больш дасканалымі і прадукцыйнымі спосабамі перапрацоўкі чыгуну ў С. — бесемераўскім, тамасаўскім, мартэнаўскім і кіслародна-канвертарным працэсамі (гл. адпаведныя арт.). У канцы 19 ст. пачалі выкарыстоўваць выплаўку С. ў эл. печах. У 20 ст. распрацаваны спосабы вытв-сці С., якія дазволілі атрымліваць асабліва чысты метал: *вакуумная плаўка ў дугавых печах* і *індукцыйных печах*, *вакуумна-дугавы пераплаў*, *электрашлакавы пераплаў*, плаўка ў *электронна-прамяневых печах*, *плазменных печах* (гл. *Вакуумная металургія*, *Плазменная металургія*). Структуру і ўласцівасці С. вывучаюць *металафізіка* і *металазнаўства*.

На Беларусі даследаванні С. вядуцца ў Ін-це фізікі цвёрдага цела і паўправаднікоў, Фіз.-тэхн. ін-це Нац. АН, у Бел. нац. тэхн. ун-це, інш. ВНУ і галіновых НДІ. Асн. вытворца С. (чорнага пракату) — *Беларускі металургічны завод* у Жлобіне. Вытв-сць С. ёсць таксама на з-дах «Цэнтраліт» (Гомель), МТЗ, МАЗ і інш.

Літ.: Дреге В. Сталь как конструкционный материал: Пер. с нем. М., 1967; Гуляев А.П. Металловедение. 6 изд. М., 1986; Физическое металловедение: Пер. с англ. Т. 1—3. 3 изд. М., 1987; Венецкий С.И. Рассказы о металлах. 4 изд. М., 1985; Яго ж. От костра до плазмы: Рассказ о многовековом пути, пройденном металлургией... М., 1968; Стальной слиток. Т. 1—3. Мн., 2000—01; Мозберг Р.К. Материаловедение. 2 изд. М., 1991. *А.П.Ласкаўнёў, У.М.Сацута.*



Да арт. **Сталь**. Дыяграма стану «жалеза—вуглярод»: вобласць з блакітным фонам адпавядае сталі, астатняя — чыгуну.



Мікраструктуры **сталей**: 1 — С = 0,5%, структура Ф + $Ц_{II}$; 2 — С = 0,15%, Ф+П; 3 — С = 0,35%, Ф + П; 4 — С = 0,8%, структура — пласціністы перліт П; 5 — С = 0,8%, структура — зярністы перліт П; 6 — С = 1,2%, П + $Ц_{II}$; С — вуглярод; Ф — ферыт; Ц — цэментыт; П — эўтэктоідная сумесь (павелічэнне × 500).

СТАЛЬ (Staël) Ганна Луіза Жэрмена дэ (22.4.1766, Парыж — 14.7.1817), французская пісьменніца, тэарэтык л-ры, публіцыст. Дачка Ж.*Некера*. Літ. дзейнасць спалучала з заняткамі палітыкай, філасофіяй, гісторыяй. Шмат падарожнічала. Погляды С. фарміраваліся пад уплывам сярэдневяковага мастацтва, творчасці У.Шэкспіра, ням. л-ры і філасофіі. Асн. тэмы яе твораў — асоба і гісторыя, пісьменнік і грамадства, пачуццё і афіц. мараль: трагедыя «Джэйн Грэй» (1790), раманы «Дэльфіна» (1802), «Карына, або Італія» (1807). Аўтар філас.-публіцыст. і літ.-крытычных эсэ і трактатаў «Лісты пра творы і асобу Ж.Ж.Русо» (1788), «Пра мастацкую творчасць» (1795), «Пра ўплыў страсцей на шчасце людзей і народаў» (1796), «Аб літаратуры, разгледжанай у сувязі з грамадскімі законамі» (1800), мемуараў «Дзесяць гадоў у выгнанні» (апубл. 1821, незавершаны) і інш. Паўплывала на распрацоўку эстэтыкі ранняга рамантызму (кн. «Аб Германіі», 1810).

Тв.: Рус. пер. — Корина, или Италия. М., 1969; О литературе, рассмотренной в связи с общественными установлениями. М., 1989.

Літ.: Пронин В.Н. Проблемы литературы и революции в творчестве Жермены де Сталь. М., 1974. *Е.А.Лявонава.*

СТАЛЬМАКО́Ў Юрый Міхайлавіч (24.10.1902 — 9.3.1958), бел. кінарэжысёр. Засл. арт. Беларусі (1955). Скончыў Дзярж. тэхнікум кінематаграфіі ў Маскве (1928). Працаваў на кінастудыях, у т.л. «Савецкая Беларусь» (1932—41), «Беларусьфільм» з 1945. З 1935 рэжысёр дакумент. кіно. Сярод фільмаў: «Фізічная геаграфія БССР» (1935, з Л.Пушам), «Пушкін» (1937), «Ваенная гігіена» (1940), «Пераможны май» (1945), «Суд народа», «Свята вызвалення» (абодва 1946) і інш. Здымаў кіначасопісы «Савецкая Беларусь» (з сярэдзіны 1930-х г.) і «Піянер Беларусі» (з 1952).

СТАЛЬМА́ШНАЕ РАМЯСТВО́, выраб транспартных гужавых сродкаў. Аб'ядноўвае шэраг функцыянальна блізкіх промыслаў: выраб колаў, калёс, мажар, брычак, саней, вазкоў і інш. Выраб ко-

лавых (летніх трансп. сродкаў) больш складаны за выраб палазных (зімовых). На Беларусі карпусы рабочых вазоў для сваіх патрэб рабілі многія сяляне, а колы для іх часцей куплялі ў майстроўстальмахоў. Выраб колаў, які патрабаваў высокага майстэрства, спец. прыстасаванняў і інструментаў, часта вылучаўся ў самаст. промысел, цесна звязаны з рынкам. Вытв-сць колаў была дыферэнцыраванай (гнуцё абадоў, выраб калодак, акоўка колаў). Абады для колаў выраблялі з гнуткіх парод драўніны — дубу, вязу, клёну. Загатоўкі для абадоў папярэдне распарвалі ў парні ці лазні і гнулі на гбале (бабе). Тым жа спосабам гнулі дугі і санныя палазы на гбалах адпаведнай формы. Сагнутыя абады звязвалі па канцах і сушылі каля 2 тыдняў. Калодкі для колаў выраблялі з бярозы-чаточкі, радзей — з дубу ці вольхі. У іх выразалі лапаценем адтуліны пад вось, а вонкавую паверхню апрацоўвалі на такарным станку. Па акружнасці ў сярэдзіне калодкі выдзёўбвалі 4-вугольныя гнёзды для спіц. Спіцы выраблялі з дубу ці ясеню, сушылі і забівалі ў гнёзды сырых калодак. Насаджвалі спіцы звычайна не перпендыкулярна да калодкі, а з некат. нахілам, каб прадухіліць калыванне колаў у час руху. Пасля замацавання спіц на колесні насаджвалі абады. Пярэднія колы рабілі крыху меншымі за заднія. На Беларусі найб. пашыраныя былі абадныя колы. Яны вядомы з часоў Стараж. Русі (раней сустракаліся ў скіфскіх і сармацкіх павозках). Былі і колы неабадныя: архаічныя суцэльнакругавыя (без спіц) і т.зв. звенчаковыя з дубу ці бярозы дугападобныя часткі. Да пач. 20 ст. сялянскія вазы рабілі амаль цалкам з дрэва. Для павелічэння тэрміну службы ў адтуліну кола з двух бакоў забівалі выкаваныя ў кузні жалезныя ўтулкі (буксы), а паверх калодкі надзявалі абручыкі (рэхвы). Выкарыстанне жалезных шын рабіла неабавязковым ужыванне цэласных абадоў. З канца 20 ст. ў рабочых вазах часцей выкарыстоўваюць гумавыя колы. Выцясненне гужавых трансп. сродкаў аўтамабілем прывяло да скарачэння С.р.

В.С.Цітоў.

СТАЛЬМАШО́НАК Іваң Майсеевіч (30.4.1902, в. Хімное, Мінская вобл. — 12.1.1976), бел. вучоны ў галіне хірургіі. Канд. мед. н. (1937), дацэнт (1938). Засл. ўрач Беларусі (1948). Скончыў БДУ (1927) і працаваў у Мінску. З 1944 у Мінскім мед. ін-це (у 1950—68 заг. кафедры, у 1951—61 дырэктар), адначасова ў 1944—51 дырэктар НДІ гематалогіі і пераліванне крыві. Навук. працы па пытаннях пераліванне крыві, брушной хірургіі, гісторыі хірургіі. Распрацаваў спосабы аперацый па стварэнні штучнага стрававода, рэзекцыі страўніка пры пухлінах. Укараніў у практыку астэасінтэзу пры адкрытых і закрытых пераломах трубчастых касцей касцяны шпянёк.

Тв.: Прободная язва желудка и ее лечение. Мн., 1949; Оперативное лечение закрытых и открытых переломов. Мн.. 1952; Оперативное лечение рубцовых сужений пищевода и желудка. Мн., 1970.

СТАЛЬМАШО́НАК (Сцельмашонак) Уладзімір Іванавіч (н. 6.2.1928, Мінск), бел. мастак, педагог. Засл. дз. маст. Беларусі (1981). Нар. маст. Беларусі (1988). Скончыў Ін-т жывапісу, скульптуры і архітэктуры імя І.Рэпіна ў Ленінградзе (1957). У 1957—2000 выкладаў у Бел. АМ. Старшыня праўлення Саюза мастакоў Беларусі (1965—68, 1987—89). Працуе ў станковым жывапісе (пераважна ў жанры партрэта) і манументальна-дэкар. мастацтве. Жывапісным творам уласцівы арыгінальнасць кампазіцыйных вырашэнняў, гарманічныя суадносіны элементаў пластычнай



У.І.**Стальмашонак**.

формы, дэкар. выразнасць колераў, манументалізацыя вобразаў. Сярод работ: «Студэнтка» (1953), партрэты В.Сядых і К.Гарулі (1958), нар. паэта Беларусі Я.Коласа (1967), нар. арт. СССР Р.Р.Шырмы (1968), «Народныя камісары БССР. Дз.Ф.Жылуновіч, А.Ф.Мяснікоў, В.Г.Кнорын, І.А.Адамовіч, А.Р.Чарвякоў» (1971), Героя Сав. Саюза і Героя Сац. Працы К.П.Арлоўскага (1975), «Словы паэта» (1981), партрэты М.Гарэцкага (1983), П.А.Жалезняковіча, групавыя партрэты Герояў Сац. Працы калгаса «Аснежыцкі» (усе 1984—86), «Славутасці Беларусі. Вялікія князі літоўскія» (1993), партрэты Ф.Скарыны, Я.Купалы (абодва 1990), трыпціх «Сыны Радзімы» (1970), серыі партрэтаў «Радзівілы» (1980—2001), «Інбелкульт», «Міцкевіч. Музы Міцкевіча» (абедзве 1999—2000), «Радня» (2001—01), «Ганаровыя грамадзяне Мінска» (2001) і інш. Выканаў вітражы: «Я.Купала» ў Літ. музеі Я.Купалы (1972) і Доме літаратара (1976), «Свята зямлі Беларускай» у Доме мод № 2 (1980—81, з В.Даўгалам) у Мінску, «Мінск і мінчане» і «Мінск» для рэстарана «Мінск» у г. Патсдам (Германія, 1976—77), на станцыі метро «Плошча Перамогі» (1979—82, з Даўгалам), размалёўку «Беларускі канцэрт» у Палацы культуры хімікаў у г. Светлагорск, сграфіта «Рабінка» і «Беларускі матыў» у санаторыі «Беларусь» у г. Міскор (Украіна; усе 1972), фларэнційскую мазаіку на станцыі метро «Маскоўская» ў Мінску (1979—82, з Даўгалам).

Літ.: Дарский Э. Владимир Стельмашонок. М., 1983; Частнова Р.П. Уладзімір Стальмашонак. Мн., 1983. *Л.Ф.Салавей.*

СТА́ЛЬНІК, ваўчук (Ononis), род кветкавых раслін сям. струкавых. Каля 70 відаў. Пашыраны ў Еўропе, Зах. Азіі, Паўн. Афрыцы. На Беларусі 1 від — С. палявы (O. arvensis). Трапляецца ў хмызняках, па схілах, уздоўж дарог, каля жылля.

Шматгадовыя травяністыя расліны або паўкусты. Сцёблы прамастойныя, узыходныя або сцелістыя, часам з калючкамі. Лісце простае ці трайчастае, чаргаванае, з прылісткамі.



У.**Стальмашонак**. Славутасці Беларусі. Вялікія князі літоўскія. 1993.

Кветкі ў верхавінкавых коласападобных суквеццях або па 1—2 у пазухах лісця, белаватыя, жоўтыя ці ружаватыя. Лек., фарбавальныя, меданосныя і дэкар. расліны.

А.М.Скуратовіч.



Стальнік калючы.

СТАЛЬНО́Е, радовішча *трэпелу* ў Хоцімскім р-не Магілёўскай вобл., каля ўсх. ускраіны в. Васілеўка 1-я. Назва ад урочышча Стальное. Пластападобны паклад звязаны з адкладамі каньякскага яруса верхняга аддзела мелавой сістэмы. Трэпел шэры, вапнавы, з гнёздамі апокі, шчыльны, месцамі трэшчынаваты, тонкадысперсны. Складзены з мінералаў апал-крыстабаліту, рэнтгенаморфнага апалу, цэалітаў, кальцыту і мантмарыланіту. Папярэдне разведаныя запасы 79,9 млн. т. Магутнасць карыснай тоўшчы 5,9—23,6 м, ускрышы (супескі, суглінкі, пяскі) 0,8—15,1 м. Трэпел прыдатны як гідраўлічная актыўная мінер. дабаўка пры вытв-сці цэменту, як натуральны фільтр пры ачыстцы вод, газаў і інш., пры рэкультывацыі забруджаных зямель, у жывёлагадоўлі.

А.П.Шчураў.

«СТАЛЬНЫ́ ПАКТ», адна з пашыраных у гістарыяграфіі назваў *германа-італьянскага дагавора 1939.*

СТАЛЬНЫ́Я КАНСТРУ́КЦЫІ, канструкцыі, элементы якіх зроблены са *сталі* розных марак (нізкавугляродзістай, нізкалегіраванай, высокатрывалай і інш.). Вызначаюцца адноснай лёгкасцю, разнастайнасцю форм, высокай трываласцю, індустрыяльнымі спосабамі вырабу і мантажу, магчымасцю выкарыстання ў спалучэнні з інш. матэрыяламі.

Стальнымі робяць: *нясучыя канструкцыі* і *агараджальныя канструкцыі* будынкаў і збудаванняў, разнастайныя вісячыя, зварныя, ліставыя, танкасценныя канструкцыі (гл. адпаведныя арт.); газа- і нафтаправоды, водана-



Сталярна-цяслярскі інструмент: 1 — сякера з тапарышчам; 2 — цяслярскі малаток; 3 — нажоўка па дрэве; 4 і 5 — лучковыя пілы; 6 — лобзік; 7 — наградка (для нескразных прапілаў пазоў); 8 — фанерная піла; 9 — галтэль (для выстругвання жалабкоў); 10 — рубанак-шэрхебель (з прамым і авальным лязом); 11 і 12 — сталярнае і цяслярнае долаты; 13 — шасцярочны аднаскарасны дрыль; 14 — транспарцір-вугламер; 15 — ватэрпас.



Стальныя канструкцыі: 1 — двухтаўровая пракатная бэлька; 2 — бэлька-швелер; 3 — трохвугольная ферма; 4 — суцэльная рама; 5 — папярэдне напружаная вантавая канструкцыя; 6 — арка з зацяжкай; 7 — прасторавы стрыжнёвы купал; 8 — прасторавая канструкцыя з плоскіх фермаў.

порныя, радыё- і тэлевізійныя вежы, апоры ЛЭП, пралётныя канструкцыі мастоў, рэзервуары, марскія платформы, буравыя вышкі, нясучыя канструкцыі пад'ёмных кранаў і інш. Асн. недахопы С.к. — схільнасць да *карозіі* і зніжэнне трываласці пры высокіх т-рах.

СТАЛЯ́РНА-ЦЯСЛЯ́РСКІ ІНСТРУМЕ́НТ, ручны або механізаваны інструмент для апрацоўкі драўніны і інш. драўняных матэрыялаў. Выкарыстоўваецца пры выкананні *сталярных работ* і *цяслярных работ*: ім распілоўваюць і надаюць розную прафіляваную паверхню драўляным вырабам, утвараюць гнёзды і адтуліны, пазы, цыклююць і шліфуюць. Падзяляецца на вымяральна-разметачны, рэжучы і дапаможны.

Вымяральна-разметачны інструмент: *лінейка, рулетка, кронцыркуль, нутрамер, рэйсмус, адвес, шаблон, вугольнік*, ватэрпас, скаба і інш.

(гл. таксама *Разметка*). Для больш дакладных вымярэнняў выкарыстоўваюць *глыбінямеры, калібры, мікраметры*, розныя *штангенінструменты*. Рэзальны інструмент: *пілы, свердлы, долаты, стругі, дрылі, калаўроты, сякеры*, рубанкі і інш. (гл. *Дрэварэзальны інструмент*), а таксама механізаваныя дрэварэзальныя і дрэваапрацоўчыя *ручныя машыны* (дыскавыя і *ланцуговыя пілы, нажоўкі*, электрарубанкі і інш.). Дапаможны інструмент: малаткі, адвёрткі, пласкагубцы, гаечныя ключы, кусачкі, клешчы, *метчыкі*, тачылы і інш.

Літ.: Инструменты и приспособления. 2 изд. Мн., 1997; Умелец в доме. М., 1998.

СТАЛЯ́РНЫЯ РАБО́ТЫ, работы, звязаныя з вытворчасцю і ўстаноўкай сталярных вырабаў. Уключаюць *разметку, апрацоўку драўніны*, падгонку элементаў вырабаў, іх склейванне, абліцоўванне, зборку і аддзелку. Ад *цяслярных работ* адрозніваюцца больш дакладнай і акуратнай апрацоўкай драўняных матэрыялаў, лепшай аддзелкай вырабаў.

Бываюць беладрэўныя (з выкарыстаннем драўніны хвойных і мяккіх лісцевых парод) і чырванадрэўныя (з выкарыстаннем драўніны цвёрдых лісцевых дэкар. парод і абліцоўкай дэталей шпонам); ручныя (у індывід. буд-ве, пры рамонтах, з выкарыстаннем *сталярна-цяслярскіх інструментаў*) і работы ў сталярнамех. вытв-сці (з выкарыстаннем *дрэваапрацоўчых машын*, паточных ліній і інш.). У масавай вытв-сці сталярных вырабаў С.р. зводзяцца ў асн. да мантажу канструкцыйных элементаў, канчатковай аддзелкі іх, далучэння асобных дэталей. Гл. таксама *Сталярства*.

А.А.Барташэвіч.

СТАЛЯРО́Ў Генадзь Канстанцінавіч (н. 24.10.1933, г. Вольск Саратаўскай вобл., Расія), бел. вучоны ў галіне інфарматыкі. Канд. фіз.-матэм. н. (1980). Скончыў Ленінградскі ун-т (1961). У 1968—90 у Ін-це матэматыкі АН Беларусі (заг. лабараторыі). У 1990—93 нам. дырэктара філіяла міжнар. канцэрна «Новыя інфарм. тэхналогіі». Навук. працы па пытаннях выліч.. тэхнікі, сістэмнага праграмнага забеспячэння. Распрацаваў шэраг інфарм. дакумент.-фактаграфічных сістэм, першыя на Беларусі базы даных для розных галін ведаў. Дзярж. прэмія СССР 1970, Дзярж. прэмія Беларусі 1982.

Тв.: Система автоматической обработки данных на базе языка КОБОЛ. М., 1971 (у сааўт.).

М.П.Савік.

СТАЛЯРО́Ў Іван Міхайлавіч (н. 20.5.1923, г. Віцебск), бел. мастак. Засл. дз. маст. Беларусі (1993). Скончыў Мінскае маст. вучылішча (1951), Маскоўскі паліграф. ін-т (1960). Выкладаў у віцебскіх маст.-графічным вучылішчы (з 1951), у пед. ін-це (1959—85). Працуе пераважна ў акварэлі і графіцы. Творам уласцівы натурны дакументалізм, апавядальнасць, падкрэсленая дынаміка разгортвання сюжэтнага дзеяння, тонкая нюансіроўка колеру. Тэме Вял. Айч. вайны прысвечаны работы: «Партызанская пабыўка» (1960), «Машкоўцы перад заданнем» (1965), «У разведцы» (1976), «Партызанскі хлеб» (1984), «Выхад з блакады» (1989), «Дзень расплаты» (1992), «Пайсці на заданне» (1997). Аўтар пейзажаў «Арка палаца Бухарскага хана» (1959), «Стары Полацк» (1966), «Руіны старажытнай крэпасці» (1972), «Суражская зямля» (1980), «Мармашэльскі манастыр» (1981), «Від на вёску Буева» (1998); ілюстрацый да твораў М.Горкага «Буравеснік» (1982), Я.Купалы «Курган» (1983), М.Гогаля «Страшная помста» (1985), былін і казак (1990—91).

Тв.: Акварель: Материалы и способы письма. Мн., 1980.

Літ.: Цыбульскі М. Віцебская акварэль. Віцебск. 1996.

М.Л.Цыбульскі.

СТАЛЯРО́Ў Мікалай Аляксандравіч (8.9.1870, Кіеў — 1942), украінскі і бел. матэматык. Праф. (1914). Скончыў Кіеўскі ун-т (1894). Працаваў у ВНУ Кіева і Харкава. З 1932 у БДУ (з 1938 заг. кафедры). Адначасова з 1933 у Бел. тэхнал. ін-це. Навук. працы па геаметрыі, матэм. метадах у механіцы.

Тв.: Введение в механику. [Ч. 1—4]. Мн., 1940—41.

А.А.Гусак.

СТАЛЯРО́Ў Мікалай Іванавіч (20.5.1919, г. Крычаў Магілёўскай вобл. — 14.8.1985), Герой Сав. Саюза (1943). Скончыў Чугуеўскае ваен. авіяўчылішча лётчыкаў (1940), Цэнтр. курсы ўдасканалення афіцэрскага саставу знішчальнай авіяцыі (1956). У Чырв. Арміі з 1938. У Вял. Айч. вайну з 1941 у Закаўказскай ваен. акрузе, на Сталінградскім, Калінінскім, Паўд.-Зах., 2-м Укр. франтах. Нам. камандзіра эскадрыллі лейт. С. вызначыўся ў баях пад Сталінградам, дзе да снеж. 1942 зрабіў 127 (да канца вайны 310) баявых вылетаў, збіў 6 і ў групе 4 самалёты праціўніка. Да 1960 у Сав. Арміі, потым да 1970 на адм. і гасп. рабоце.



М.І.**Сталяроў**.

СТАЛЯ́РСКІ Пётр Саламонавіч (30.11.1871, г.п. Ліпавец Вінніцкай вобл., Украіна — 29.4.1944), украінскі скрыпач-педагог; адзін з заснавальнікаў сав. скрыпічнай школы. Нар. арт. Украіны (1939). Скончыў Адэскае муз. вучылішча Рас. муз. т-ва (1900). З 1898 скрыпач у аркестры Адэскага опернага т-ра, адначасова з 1911 выкладаў у засн. ім муз. школе. З 1920 выкладаў у Адэскай кансерваторыі (з 1923 праф.), пры ёй разам з інш. музыкантамі арганізаваў школу-дзесяцігодку, на ўзор якой створаны шматлікія сярэднія муз. школы краіны. Распрацаваў новы метад прафес. навучання дзяцей ігры на скрыпцы. Сярод вучняў Л.Гілельс, Д.*Ойстрах* і інш.

Літ.: О нашем учителе: К столетию П.С.Столярского: (Д.Ойстрах, С.Фурер, Л.Мордкович) // Сов. музыка. 1972. № 3.

СТАЛЯ́РСТВА, адзін з відаў дрэваапрацоўчых рамёстваў, вытворчасць сталярных вырабаў у многіх народаў свету. Спалучалася з *цяслярствам* (дойлідствам). Аднак характар працы, складанасць рамеснай тэхнікі, разнастайная наменклатура вырабаў вылучылі С. ў самаст. рамяство. С. было звязана з апрацоўкай малагабарытных форм (гл. *Сталярныя работы*) і выкарыстоўвалася на завяршальнай стадыі будаўніцтва (аздабленне жылля і культавых пабудоў, асада вокнаў і дзвярэй, выраб абсталявання і прадметаў інтэр'ера — аконных рам, дзвярэй, *мэблі*, іканастасаў, хатняга начыння і інш.). С. грунтавалася на трывалых вытв. традыцыях, дасканалым веданні тэхнал. якасцей мясц. драўніны, патрабавала рознабаковых навыкаў і валодання тыпалагічна разнастайнымі дрэваапрацоўчымі інструментамі і прыстасаваннямі (гл. *Сталярна-цяслярскі інструмент*). На Беларусі неабходным прыстасаваннем майстра-сталяра быў варштат, які ставілі ў сенцах, адрыне або пад павеццю. Спец. памяшканне, абсталяванае пад майстэрню, часцей сустракалася ў гар. або местачковых сталяроў. Амаль у кожным панскім маёнтку былі майстэрні для аднаго або некалькіх сталяроў, якія былі прыпісаны да чэлядзі і часта працавалі на правах прыгонных майстроў. Нягледзячы на спецыялізацыю, што больш выразна назіралася ў гарадах і мястэчках, С. звычайна спалучалася і з інш. дрэваапрацоўчымі рамёствамі і з земляробствам. Многія сяляне, што валодалі сталярскімі навыкамі і вялі сваю гаспадар-



І.**Сталяроў**. Стары Полацк. 1966.

ку, у парадку адбывання паншчыннай павіннасці прымалі ўдзел у будаўніцтве панскіх маёнткаў, цэркваў, мастоў і інш. С. насіла прыкметны сезонны (у асн. асенне-зімовы) характар. Майстры-сталяры працавалі звычайна ў адзіночку, некат. мелі вучняў ці падсобных работнікаў, якія працавалі па найме. У сярэдневякоўі важную ролю ў арганізацыі С. адыгрывалі цэхі. З ажыўленнем таварна-гандл. адносін і развіццём капіталіст. ўкладу адбываліся змены ў сац. структуры і характары С., якое з надомнага станавілася асобнай галіною вытворчасці. Нар. рамёствы паслужылі вытокамі развіцця сучасных галін дрэваапр. прам-сці — мэблевай, домабуд., лесапільнай, тарнай. Нягледзячы на агульнае скарачэнне, С. развіваецца ў выглядзе асобнага промыслу. *В.С.Цітоў.*

СТАМАТАЛО́ГІЯ [ад грэч. stoma (stomatos) рот +*...логія*], галіна клінічнай медыцыны, якая вывучае этыялогію, патагенез хвароб і пашкоджанняў зубоў, слізістай абалонкі рота, сківіц і інш. органаў поласці рота і сківічна-тваравай вобласці; распрацоўвае метады іх дыягностыкі, лячэння і прафілактыкі.

Як самаст. навука ўзнікла ў 1-й чвэрці 20 ст. ад спалучэння *адонталогіі* і сківічна-тваравай хірургіі. Падзяляецца на тэрапеўт., хірург., артапедычную, С. дзіцячага ўзросту, *артадантыю*. Тэрапеўт. С. вывучае і лечыць хваробы зубоў, калязубных тканак, слізістай абалонкі рота, распрацоўвае метады неаперацыйнай тэрапіі і прафілактыкі. Хірург. С. ўключае хірургію зубоў, лячэнне запаленчых захворванняў поласці рота, сківічна-тваравай вобласці, пухлін поласці рота і сківіц, пластычную, рэканструкцыйную і эстэт. хірургію, імпланталогію. Артапедычная С. займаецца пратэзаваннем поласці рота. С. дзіцячага ўзросту таксама падзяляецца на тэрапеўт., хірург. і артадантыю, вывучае асаблівасці фарміравання і развіцця органаў і тканак сківічна-тваравай вобласці.

На Беларусі пытаннямі С. займаюцца аддзяленні сківічна-тваравай хірургіі ў Мінскім, Віцебскім мед. ун-тах, Бел. МАПА. Вядучыя спецыялісты П.А.*Леус*, А.С.Арцюшкевіч і інш.

М.Ф.Адашчык, А.С.Арцюшкевіч, Р.М.Руман.

СТАМАТЫ́Т [ад грэч. stoma (stomatos) рот], пашкоджанне слізістай абалонкі ротавай поласці. Бывае абмежаванае запаленне слізістай абалонкі языка — *гласіт*, дзёснаў — *гінгівіт*. Адрозніваюць С. афтозны, катаральны, язвавы, некратычны; востры і хранічны; першасны і другасны. Першасны ўзнікае пры траўматычных пашкоджаннях слізістай абалонкі поласці рота (напр., прыкусванне, раненне, зубны камень, няякасныя пломбы — мех. траўмы), хім. і тэрмічных апёках, ад мікробаў, вірусаў. Пашыраны С. ад віруснай інфекцыі (напр., востры герпетычны ў дзяцей — праява першаснага інфіцыравання поласці рота вірусам *герпесу*). Другасны С. — вынік парушэнняў абмену рэчываў, хвароб нерв. сістэмы, СНІДу і інш. Агульныя прыкметы: пачырваненне і набраканне слізістай абалонкі поласці рота, высыпка, боль, непрыемны пах з рота. Лячэнне: процізапаленчая і сімпатаматычная тэрапія.

А.С.Арцюшкевіч, З.Р.Валеева.

СТАМА́ЦІ (Stamati) Канстанцін (1786, г. Хушы, Румынія — 12.9.1869), малдаўскі і румынскі пісьменнік. Аўтар лірычных і сатыр. вершаў, баек, паэм, драм. сцэнак, публіцыстычных артыкулаў, гіст. паэмы «Казка казак» (позняя назва — «Герой Чубэр-водэ...», 1843), кн. «Румынская муза» (1868). У творах адлюстроўваў гераічнае мінулае, барацьбу народа супраць іншаземных прыгнятальнікаў. Паўплываў на развіццё літ. жанраў малд. і рум. л-р.

Тв.: Рус. пер. — Избранное. Кишинев, 1959.

Літ.: Грекул И.Д. Константин Стамати. Кишинев, 1959.

СТАМБАЛІ́ЙСКІ Аляксандр Стаіменаў (1.3.1879, г. Славовіца, Балгарыя — 14.6.1923), балгарскі паліт. і дзярж. дзеяч. Вучыўся аграноміі ў Германіі (1900—02). З 1902 адзін з лідэраў Балг. земляробчага нар. саюза (БЗНС). Выступаў супраць германафільскай палітыкі цара Фердынанда і ўрада В.Радаславава. У 1915 арыштаваны і прыгавораны да пажыццёвага зняволення. У 1918 амнісціраваны. З кастр. 1919 кіраўнік кааліцыйнага, з мая 1920 аднапарт. (БЗНС) урада Балгарыі. Адзін са стваральнікаў тэорыі аграрызму, паводле якой асновай паліт. жыцця краіны абвяшчалася сялянства. Урад С. правёў шэраг дэмакр. рэформ, спрабаваў наладзіць адносіны з Сав. Расіяй, але 9.6.1923 у выніку ваен. перавароту скінуты. С. спрабаваў узняць у адказ сял. паўстанне, але быў схоплены і пасля катаванняў забіты.

СТАМБУ́Л, Істанбул (Istanbul), найбуйнейшы горад Турцыі, на абодвух берагах праліва Басфор каля Мармуровага мора. Адм. ц. іля Стамбул. 9451 тыс. ж. з прыгарадамі і суседнімі гарадамі (2000). Буйны трансп. вузел на шляхах з Цэнтр. і Паўд.-Усх. Еўропы ў Пярэднюю Азію; 1-ы порт краіны па імпарце, 2-і па экспарце. Міжнар. аэрапорт. Гандл.-фін., прамысл. і культ. цэнтр краіны. У С. сканцэнтравана ка-



Стамбул. Будынак археалагічнага музея.



Мячэць Сулеймана I у **Стамбуле**.



Горад **Стамбул**.

ля 60 % прамысл. вытв-сці краіны, асн. банкі, страхавыя таварыствы і агенцтвы. Прам-сць: маш.-буд., у т.л. суднабуд., эл.-тэхн., зборачныя з-ды; харч. і харчасмакавая, у т.л. мукамольная, мяса-малочная, кандытарская, вінна-гарэлачная, тытунёвая; хім., тэкст., цэм., гарбарна-абутковая, швейная, мэблевая, папяровая, шкляная, паліграф., дрэваапр., буд. матэрыялаў.

Гісторыю горада да заваявання ў 1453 туркамі гл. ў арт. *Канстанцінопаль*. З 1453 да 13.10.1923 С. — сталіца Асманскай імперыі. З-за знаходжання на стратэгічным марскім шляху з Чорнага ў Міжземнае мора С. — аб'ект барацьбы зах.-еўрап. дзяржаў і Расіі. У канцы 19 — пач. 20 ст. ў С. пачаўся рух *младатуркаў; цэнтр младатурэцкай рэвалюцыі 1908*. Пытанне аб С. і чарнаморскіх пралівах было ў ліку тых, што прывялі да 1-й сусв. вайны 1914—18. У *грэка-турэцкую вайну 1919—22* акупіраваны брыт. войскамі. Адзін з цэнтраў *Кемалісцкай рэвалюцыі* (1919—23). Пасля пераносу ў 1923 сталіцы ў Анкару захаваў значэнне важнага цэнтра Турцыі. У С. знаходзіцца кафедра Канстанцінопальскага патрыярха, які намінальна захоўвае тытул Усяленскага.



Стамбул. Палац Далмабахчэ.

Ад візант. часоў захаваліся рэшткі імператарскага палаца, акведук Валента, руіны гар. сцен, падземныя цыстэрны і інш. Сярод помнікаў візант. архітэктуры: базіліка св. Іаана Студзіта (Эмір Ахор-джамісі; 5 ст., зруйнавана ў пач. 13 ст., адноўлена ў канцы 13 ст.; цяпер у руінах), *Канстанцінопальскі Сафійскі сабор*, цэрквы св. Сергія і Вакха (Кючук Ая-Сафія; 6 ст.), Ірыны (6 ст., зруйнавана ў 6 і 8 ст., адноўлена), Фёдара (Кілісе-джамі; 11 ст., 14 ст., мазаікі 14 ст.); манастыроў Пантакратара (Зейрэк-джамі; 12 ст.), Хара (Кахрыэ-джамі; 13 — 14 ст., мазаікі 14 ст.). Большасць цэркваў перароблена ў мячэці. Помнікі тур. сярэдневякоўя: крэпасці Анадалухісары (14 ст.), Румеліхісары (1452), Едыкуле (1457); мячэці Баязіда II (1501—06, дойлід Хайрэддзінага), Шахзадэ (1548), Сулеймана I (1550—57, абедзве дойлід Сінан), Ахмеда I (1609—17, дойлід Мехмет-ага); медрэсэ Баязіда II (16 ст.), комплекс палаца султана Тапкапы (15—19 ст.; цяпер музей), палац Далмабахчэ (рэканструяваны ў 1853), маўзалеі, фантаны. Пабудовы 20 ст. пераважна ў духу неакласіцызму і функцыяналізму: Палац справядлівасці, атэль «Хілтан», муніцыпалітэт і інш. З ун-ты, у т.л. *Стамбульскі універсітэт*. Акадэміі эканомікі і гандлю, мастацтваў. Музеі: храма св. Сафіі, археал., жывапісу і скульптуры, тур. і ісламскага мастацтва, янычар і інш. Турыстычны цэнтр сусв. значэння. Тэатры: оперы і балета,гарадскі; сімф. аркестр. У С. праводзіцца (з 1972) Міжнар. муз. фестываль. Гіст. цэнтр С. ўключаны ЮНЕСКА у спіс *Сусветнай спадчыны*.

Літ.: Петросян Ю.А., Юсупов А.Р. Город на двух континентах: Византий, Константинополь, Стамбул. 2 изд. М., 1981.

СТАМБУ́ЛЬСКІ УНІВЕРСІТЭ́Т, адзін са старэйшых і буйнейшых ун-таў Турцыі. Засн. ў 1453 (паводле інш. звестак у 1321) у г. Стамбул як мусульм. вышэйшая школа. З 1846 ун-т; першая свецкая ВНУ у Турцыі. Ун-т некалькі разоў быў закрыты. У 2001/02 навуч. г. ў С. у. 25 374 студэнты, у т.л. 1928 замежных; 4812 выкладчыкаў; ф-ты: мед.; мед. імя Джэрахпашы; стаматалагічны; вет.; пед. імя Хасана Алі Юджэл; юрыд.; багаслоўскі; прыродазнаўчых навук; фармацэўтычны; сувязі; паліт. навук; лесаводства; л-ры; эканам.; кіравання гаспадараннем; інжынерны; водная гаспадаркі. У складзе ун-та аддзяленні (інфармацыі; мастацтваў; фізкультуры і спорту; па вывучэнні турэцкай мовы, замежных моў), вышэйшыя школы (кансерваторыя; аховы здароўя Бакыркой, Шышлі; мед. сясцёр; мед. абслугоўвання; фізіятэрапіі і рэабілітацыі; грамадскіх навук; тэхн. навук; права; фізкультуры і спорту; транспарту; кіравання лесагаспадаркай), ін-ты (кардыялагічны; дзіцячага здароўя; туберкулёзу і захворванняў лёгкіх; неўралогіі; эксперыментальнай медыцыны; суд. медыцыны; анкалагічны; грамадскіх навук; прыродазнаўчых навук; аховы здароўя; марскіх навук і кіравання; прынцыпаў Ататюрка і гісторыі рэвалюцыі; кіравання эканомікай; еўраазіяцкай археалогіі; бухгалтэрыі); цэнтры даследавання (дэрматалогіі; малекулярнай анкалогіі і гемапаталогіі; медыцыны Джэрахпашы, выкарыстання медыцыны; выкарыстання нар. медыцыны; гепатапанкрэаталагічных хвароб; традыц. лекавых сродкаў; лекаў з раслін; выкарыстання генетыкі; біятэхнікі і генетычнага інжынерынгу; праблем навакольнага асяроддзя; беспрытульных дзяцей; выкарыстання камп'ютэрных навук; жаночых праблем; еўрапейскай супольнасці; лінгвістычны; правоў чалавека; прыродных багаццяў; абсерваторыі).

СТА́МІЦ (Stamic, Stamitz) Ян Вацлаў Антанін (Іаган Венцэль Антон; 19.6.1717, г. Гаўлічкаў-Брод, Чэхія — 27.3.1757), чэшскі кампазітар, скрыпач, дырыжор, педагог; заснавальнік *мангеймскай школы*, новага канцэртнага стылю арк. выканання. Вучыўся ў бацькі Антаніна Ігната С., у езуіцкай гімназіі ў Йіглаве (Чэхія, 1728—34). Як скрыпач-віртуоз шмат канцэртаваў. Прыдворны музыкант у Пфальцы і Мангейме, кіраваў прыдворнай капэлай у Штутгарце. З 1744 1-ы скрыпач, з 1748 кіраўнік Мангеймскай капэлы. Спрыяў станаўленню класічнага тыпу 4-часткавай сімфоніі, узмацніў тэматычныя і дынамічныя кантрасты ў санатна-сімф. цыкле, рэфарматар аркестра (уключыў у яго склад валторны і кларнеты). Сярод твораў: больш за 70 сімфоній, 10 арк. трыо, 16 канцэртаў для скрыпкі з арк., канцэрт для кларнета з арк. (першы ў гісторыі музыкі), камерна-інстр. ансамблі, культавая хар. музыка і інш. Паўплываў на творчасць еўрап. кампазітараў 18 ст. Сярод вучняў яго сыны Карэл С. і Антанін С. і інш. *Н.В.Сазановіч.*

СТАМПКО́ЎСКАЯ Алена Канстанцінаўна (1921, в. Мазуршчына Салігорскага р-на Мінскай вобл. — 26.6.1942), Герой Сав. Саюза (1946). Скончыла курсы радыётэлеграфістаў (1941). У Вял. Айч. вайну з 1942 на Паўд.-Зах. фронце. Радыстка мал. сяржант С. вызначыласяў чэрв. 1942 у час абарончай аперацыі Сталінградскай бітвы ў баі каля в. Зімавенькі Белгародскай вобл. (Расія), дзе ў час прарыву батальёна з акружэння, прыкрываючы адыход асн. сіл, выклікала агонь на сябе; загінула ў гэтым баі. У кішлаку Баяут-1 Сырдар'інскай вобл. (Узбекістан), дзе яна жыла, пастаўлены помнік.



А.К.**Стампкоўская**.

СТАН ДЗЕЯСЛО́ВА, катэгорыя *дзеяслова*, якая паказвае на адносіны дзеяння да суб'екта (утваральніка дзеяння) і аб'екта (прадмета, на які накіравана дзеянне).

У сучаснай бел. мове вылучаюцца 2 С.дз.: залежны і незалежны. Калі дзеянне накіравана на суб'ект («дом будуецца рабочымі»), тады С.дз. вызначаецца як з а л е ж н ы. Пры гэтым назва ўтваральніка дзеяння («рабочымі») у сказе мае форму творнага склону і выступае не ў ролі дзейніка, а дапаўнення. Такія сінтакс. канструкцыі называюць пасіўнымі. Калі ж дзеянне на суб'ект не накіравана («рабочыя будуюць дом», «чалавек ідзе па дарозе»), тады С.дз. вызначаецца як н е з а л е ж н ы. Такія сінтакс. канструкцыі называюць актыўнымі. Залежны і незалежны С.дз. маюць толькі пераходныя дзеясловы, усе непераходныя адносяцца да незалежнага.

Літ.: Шуба П.П. Дзеяслоў у беларускай мове. Мн., 1968; Беларуская граматыка. Ч. 1. Мн., 1985. *П.П.Шуба.*

СТАНАВО́Е НАГО́Р'Е, горная сістэма ва Усх. Сібіры, пераважна на тэр. Бураціі, у Расіі. Працягваецца ад паўн. краю воз. Байкал да сярэдняга цячэння р. Алёкма. Даўж. каля 700 км, шыр. больш за 200 км. Горныя хрыбты (выш. да 2999 м) выцягнуты ва ўсх.-паўн. напрамку, чаргуюцца з міжгорнымі катлавінамі (на выш. 500—1000 м). Складзена ў асн. з крышт. і метамарфічных парод. Значная сейсмічнасць. Шматгадовая мерзлата. Карысныя выкапні: золата, медзь, флюарыт, каменны вугаль. Клімат рэзка кантынентальны. Лета ў катлавінах цёплае, доўжыцца 2—3

месяцы, у высакагор'і — халаднаватае і кароткае (месцамі менш за 1 месяц). Зіма вельмі халодная і працяглая. Ападкаў за год ад 300—400 мм у катлавінах, да 1000 мм у гарах. Невял. ледавікі. Рачная сетка густая, шмат азёр. На схілах — лістоўнічная тайга, вышэй за 1200 м — рэдкалессе і горная тундра. У катлавінах — забалочаныя поймавыя лугі, на схілах — хваёвыя і хваёва-лістоўнічныя лясы. Нагор'е перасякае *Байкала-Амурская магістраль.*

СТАНАВЫ́ ПРЫСТАЎ, станавы, паліцэйская пасада ў Рас. імперыі ў 1837—1917. Засн. ў 1837 у кожным стане — паліцэйскай тэр. адзінцы, на якія падзяляліся паветы. С.п. прызначаўся і звальняўся губернатарам з кандыдатаў, прадстаўленых мясц. дваранствам. Падпарадкоўваўся спраўніку і ніжняму земскаму суду, з 1862 — павятоваму паліцэйскаму ўпраўленню. З 1878 у распараджэнні С.п. былі паліцэйскія ўрадні кі. Пасада існавала да Лют. рэвалюцыі 1917.

СТАНАВЫ́ ХРЫБЕ́Т, сістэма горных хрыбтоў ва Усх. Сібіры і на Д. Усходзе Расіі, пераважна ў Якуціі (Саха) і Амурскай вобл.; водападзел паміж басейнамі рэк Паўн. Ледавітага і Ціхага акіянаў. Працягваецца ад сярэдняга цячэння р. Алёкма да вытокаў р. Учур (бас. р. Алдан). Даўж. каля 700 км, шыр. 100—180 км. Пераважаюць выш. 1500—2000. м, найб. 2412 м. 2 паралельныя хрыбты падзелены падоўжнымі далінамі. Складзены з дакембрыйскіх і ніжнепалеазойскіх адкладаў, у шматлікіх мясцінах перарваных інтрузіямі гранітаў. Шматгадовая мерзлата. Радовішчы золата, рэдкіх металаў, кам. і бурага вугалю, жал. руды, слюды. Клімат суровы, кантынентальны. Зіма халодная і працяглая, маразы да -30, -40 °С. Ападкаў каля 500 мм за год (да 80% выпадае летам). Рэкі бас. Лены і Амура. Схілы да 1300 м укрыты лістоўнічнымі і яловымі лясамі, вышэй зараснікі кедравага сланіку і горная тундра.

СТАНГ (Stang) Крысціян Швейнгард (15.3.1900, Осла — 2.7.1977), нарвежскі славіст. Д-р філасофіі (1929). Скончыў ун-т у Осла (1927), у 1938—70 праф. кафедры слав. моў гэтага ун-та. Аўтар прац у галіне параўнальна-гіст. індаеўрап. і слав. мовазнаўства. Шмат увагі аддаваў гісторыі ўсх.-слав. моў, асабліва беларускай. У кн. «Заходняруская канцылярская мова Вялікага княства Літоўскага» (1935, на ням. мове) на вял. фактычным матэрыяле з юрыд. пісьмовых помнікаў абгрунтаваў сцвярджанне аб бел. аснове мовы дзелавой пісьменнасці ВКЛ. Манаграфію «Старажытнаруская мова помнікаў горада Полацка» (1939, на ням. мове) прысвяціў падрабязнаму апісанню фанетыкі, марфалогіі, сінтаксісу і лексікі полацкіх грамат 13—16 ст. Аўтар прац «Славянскі і балтыйскі дзеяслоў» (1942, на ням. мове), «Славянская акцэнтуацыя» (1967, на англ. мове). *А.І.Жураўскі.*

СТАНДА́РТ (ад англ. standard норма, узор, мерка), афіцыйны дзярж. або нарматыўна-тэхн. дакумент галіны, прадпрыемства, фірмы, які ўстанаўлівае неабходныя якасныя характарыстыкі і патрабаванні да пэўнага віду прадукцыі, тавару; узор, эталон, з якім параўноўваюцца інш. падобныя аб'екты. Пашыраюцца на ўсе сферы чалавечай дзейнасці: навуку, тэхніку, прам-сць, с.-г. вытв-сць, буд-ва, ахову здароўя, транспарт і інш. У адпаведнасці з дасягненнямі навукі і тэхнікі С. абнаўляюцца і пераглядаюцца (не радзей як адзін раз у 5 гадоў). У залежнасці ад прызначэння адрозніваюць С.: агульнатэхн. і арганізац.-метадычныя; эксплуатацыйныя ўласцівасці, тэхн. характарыстыкі, метады кантролю аднароднай прадукцыі міжгаліновага ўжытку; нормы тэхнікі бяспекі і сродкаў аховы працаўнікоў; адзінкі фіз. велічынь і праверачныя схемы; патрабаванні да стандартных узораў уласцівасцей і саставу рэчыва і матэрыялу; сістэмы класіфікацыі і кадзіравання тэхн.-эканам. інфармацыі; найважнейшыя віды прадукцыі і г.д. С. на прадукцыю падзяляюцца на С. тэхн. умоў, агульных тэхн. патрабаванняў, параметраў, тыпаў, канструкцый, марак, правіл прыёмкі, маркіроўкі, упакоўкі, захоўвання, эксплуатацыі, рамонту і інш.

У залежнасці ад сферы дзеяння і ўзроўню зацвярджэння С. у Рэспубліцы Беларусь падзяляецца на катэгорыі: дзярж. С. Рэспублікі Беларусь (СТБ), С. прадпрыемстваў і аб'яднанняў (СТП), папярэдні С., які ўжываецца для набыцця вопыту не больш чым 2 гады. Акрамя СТБ у якасці дзярж. у 2001 на Беларусі ўжываліся: міждзярж. С. (ДАСТ), правілы Еўрап. эканам. камісіі ААН (Правіла ААН), а таксама рэсп. С. БССР (РСТ БССР) і С. СЭУ (СТ СЭУ), на якія Дзяржстандарт прадоўжыў тэрмін выкарыстання. *І.В.Нікалаева.*

СТАНДА́РТНЫ ПАТЭНЦЫЯ́Л у электрахіміі, нармальны патэнцыял, значэнне *электроднага патэнцыялу*, вымеранае ў стандартных умовах, пры актыўнасці ўсіх кампанентаў электроднага працэсу роўнай 1. С.п. роўны эрс электрахім. ланцуга, складзенага са стандартнага *электрода параўнання* і электрода, што даследуюць. Для водных растворaў у якасці стандартнага выкарыстоўваюць вадародны электрод, патэнцыял якога пры ўсіх т-рах прымаюць роўным нулю. С.п. металаў і вадароду, што размешчаны паводле іх нарастання, складаюць *электрахімічны рад напружанняў.*

Разлічваюць С.п. па выніках вымярэння эрс гальванічных элементаў, а таксама на аснове стандартных значэнняў змянення энергіі Гібса ΔG°пры хім. рэакцыі. С.п. E° звязаны з ΔG° і канстантай раўнавагі K_p электрахім. рэакцыі: $-\Delta G^{\circ}=nFE^{\circ}=RT\ln Kp$, дзе F — пастаянная Фарадэя, n — колькасць электронаў, што прымаюць удзел у рэакцыі, R — газавая пастаянная, Т— абс. т-ра. Велічыні С.п. выкарыстоўваюць для тэрмадынамічных разлікаў.

СТАНДАРТЫЗА́ЦЫІ І СЕРТЫФІКА́ЦЫІ БЕЛАРУ́СКІ ДЗЯРЖА́ЎНЫ ІНСТЫТУ́Т (БЕЛДЗІСС). Засн. ў 1992 у Мінску. З'яўляецца Нац. ін-там у галіне стандартызацыі і сертыфікацыі. Асн. падраздзяленні (2002): выпрабавальны цэнтр (праводзіць выпрабаванні кліматычныя і сертыфікацыйныя па электрабяспецы, радыёперашкодах, шчыльнасці патоку энергіі, устойлівасці да знешніх эл.-магн. перашкод, цепла-, вогнеўстойлівасці і пажарнай бяспецы быт. электрапрылад і радыёэлектроннай апаратуры і інш.); Нац. інфарм. цэнтр па тэхн. бар'ерах у гандлі, санітарных і фітасанітарных мерах (для рэалізацыі пагадненняў Сусв. гандл. арг-цыі); Дзярж. цэнтр каталагізацыі прадукцыі (збор інфармацыі аб наменклатуры прадукцыі, што вырабляецца ў краіне).

Асн. кірункі дзейнасці: у галіне стандартызацыі — распрацоўка праграм па стандартызацыі розных груп прадукцыі; распрацоўка дзярж. і міждзярж. стандартаў; экспертыза праектаў стандартаў і тэхн. умоў; вядзенне Адзінай сістэмы класіфікацыі і кадзіравання; распрацоўка метадалогіі стварэння тэхн. рэгламентаў; аказанне прадпрыемствам і арг-цыям метадычнай дапамогі. У галіне сертыфікацыі — распрацоўка метадалогіі менеджменту якасці, сертыфікацыі прадукцыі, сістэм менеджменту якасці, паслуг; выкананне работ па сертыфікацыі быт. і прамысл. прадукцыі. У галіне нарматыўна-тэхнічнага інфармацыйнага забеспячэння — фарміраванне, вядзенне і актуалізацыя Нац. фонду стандартаў — больш за 160 тыс. нарматыўных дакументаў (2001); афіц. выданне і распаўсюджванне стандартаў, каталогаў, інфарм. паказальнікаў, даведачна-метадычных матэрыялаў. Выдае час. «Новости. Стандартизация и сертификация». *М.А.Кусакін.*

СТАНДАРТЫЗА́ЦЫЯ, працэс устанаўлення і выкарыстання *стандартаў* з мэтай ўпарадкавання дзейнасці ў пэўнай галіне. Аб'ектамі С. з'яўляюцца сыравіна, прадукцыя, нормы, патрабаванні, метады, тэрміны, адзнакі і г.д., якія маюць тэндэнцыю да шматразовага выкарыстання. Адрозніваюць С. міжнародную, рэгіянальную, нацыянальную, галіновую і суб'ектаў гаспадарання. У міжнароднай С. маюць права ўдзельнічаць адпаведныя органы ўсіх краін; у рэгіянальнай — адпаведныя органы пэўнага, геагр., паліт. ці эканам. рэгіёна. Нацыянальная С. ўстанаўліваецца ў канкрэтнай краіне; галіновая — у канкрэтнай галіне, суб'ектаў гаспадарання — на канкрэтным прадпрыемстве, установе, фірме і інш.

Дзярж. сістэма С. Рэспублікі Беларусь пачала фарміравацца ў 1922. Яе дзейнасць рэгламентавана Законам Рэспублікі Беларусь «Аб стандартызацыі» (1995). Яе асн. задачы і мэты: гарантыя бяспекі прадукцыі, работ і паслуг для жыцця і здароўя грамадзян і іх маёмасці; канкурэнтаздольнасці бел. тавараў на сусв. рынку; ахова навакольнага асяроддзя; сумяшчальнасць і ўзаемазамяняльнасць прадукцыі, маркіроўкі, адзін-

ства метадаў кантролю; садзейнічанне ўкараненню рэсурса- і энергазберагальных тэхналогій і г.д. Палітыку ў галіне С. ў рэспубліцы ажыццяўляюць Камітэт па стандартызацыі, метралогіі і сертыфікацыі пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь і яго органы на месцах.

І.В.Нікалаева.

СТА́НЕЎ Эміліян (сапр. імя Нікола) Стаянаў (15.2.1907, г. Тырнава, Балгарыя — 15.3.1979), балгарскі пісьменнік. Нар. дз. культ. Балгарыі (1966). Герой Сац. Працы Балгарыі (1967, 1977). Акад. Балг. АН (з 1974). Вучыўся ў Маст. акадэміі ў Сафіі, вывучаў фінансы і гандаль у Вольным ун-це. Друкаваўся з 1931. У зб-ках апавяданняў і аповесцей «Самі» (1940), «Воўчыя ночы» (1943), «У ціхі вечар» (1948), «Калі растане іней» (1950) тонкі псіхалагізм у раскрыцці характараў, глыбокае пранікненне ў свет прыроды. Раман «Іван Кандараў» (ч. 1—4, 1958—64, Дзімітроўская прэмія 1965) пра жыццё і барацьбу працоўных. Аўтар гіст. раманаў «Легенда пра Сібіна, князя праслаўскага» (1968), «Антыхрыст» (1970), «Тырнаўская царыца» (1973), кніг для дзяцей. На бел. мову апавяд. «Выкрадальнік персікаў» пераклала Л.Каўрус.

Тв.: Бел. пер. — у кн.: Скарб: Апавяданні балг. пісьменнікаў. Мн., 1967; Рус. пер. — Избранное. М., 1970; Иван Кондарев. Ч. 1—4. М., 1967; Чернушка: Повести. М., 1971.

Літ.: З а р е в П. Емилиян Станев. София, 1973.

СТАНІ́Н (ад лац. stannum волава), алавяны калчадан, звонавая руда, мінерал класа сульфідаў, сульфід медзі, жалеза і волава, $Cu_2(Fe,Zn)SnS_4$. Мае медзь 22—31%, жалеза 1—14%, волава 22—28% і прымесі: цынк (да 11%), серабро, кадмій, свінец і інш. Крышталізуецца ў тэтраганальнай сінганіі. Утварае шчыльныя дробназярністыя масы, мікраўкрапанікі. Колер сталёва-шэры. Цв. 3—4. Шчыльн. 4,3—4,5 г/см^3. Крохкі. Паўправаднік. Трапляецца ў гідратэрмальных, пегматытавых, грэйзенавых радовішчах сярод руд волава і волаваносных жылах. Радовішчы ў Расіі, Балівіі, Вялікабрытаніі, Канадзе, Чэхіі і інш.



Станін.

СТАНІ́НА, асноўная частка *корпуса* машыны, на якой манціруюць яе вузлы і агрэгаты. Забяспечвае дакладнасць узаемаразмяшчэння і перамяшчэння вузлоў і дэталей, успрымае намаганні, што ўзнікаюць паміж імі. Звычайна нерухома замацоўваецца на фундаменце. Бывае літая (з чыгуну), часам зварная (са сталі).

СТАНІСЛАВО́ВА, вёска ў Малабахаўскім с/с Дубровенскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр саўгаса. За 4 км на Пд ад г. Дуброўна, 110 км ад Віцебска, 14 км ад чыг. ст. Асінаўка. 504 ж., 215 двароў (2001). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Помнік архітэктуры — *Станіславоўская сядзіба*.

СТАНІСЛАВО́ВА, вёска ў Шаркаўшчынскім р-не Віцебскай вобл., на левым беразе р. Дзісна, на аўтадарозе Шаркаўшчына—Відзы. Цэнтр сельсавета. За 12 км на З ад г.п. і чыг. ст. Шаркаўшчына, 230 км ад Віцебска. 171 ж., 80 двароў (2001). Базавая школа, б-ка. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

СТАНІСЛАВО́ЎСКАЯ СЯДЗІ́БА, помнік сядзібна-паркавай архітэктуры 2-й пал. 18 ст. на ўскраіне Гродна ў яго б. прыгарадзе Станіславова. Сфарміравана ў 1760—70-я г. паводле праекта арх. Дж. *Сака*. Была загараднай рэзідэнцыяй караля Рэчы Паспалітай Станіслава Аўгуста Панятоўскага. Ансамбль уключаў сядзібны дом, 2 флігелі, гасп. пабудовы, парк. У планіроўцы ансамбля захаваліся элементы рэгулярнасці. Цэнтр. месца займаў сядзібны дом, размешчаны на вяршыні пакатага схілу. Дом — 1-павярховы (2-і паверх надбудаваны пазней) прамавугольны ў плане муравана будынак з 2-павярховай цэнтр. ч., вылучанай на дваровым фасадзе паўкруглым эркерам з манаграмай караля на атыку, а на галоўным — рызалітам з атыкавым завяршэннем і шырокай тэрасай. У дэкоры выкарыстаны вязкі пілястраў, раскрапаваныя карнізы, філёнгі, лепка. Прамавугольныя і арачныя аконныя праёмы аздоблены лучковымі трохвугольнымі франтонамі, гірляндамі і інш. У вестыбюлі захаваліся 2 печы ў стылі неаготыкі, аблiцаваныя паліванымі керамічнымі плiткамі (канец 19 ст.). Ніжэй за палац сіметрычна размешчаны 2 бакавыя флігелі, якія ўтвараюць парадны курданёр, абнесены з боку ўезда невысокай цаглянай агароджай з брамай. Флігелі — 1-павярховыя прамавугольныя ў плане будынкі з высокімі вальмавымі чарапічнымі дахамі. За зах. флігелем размешчаны гасп. пабудовы. За домам размяшчаўся парк рэгулярнага тыпу з радыяльна-прамянёвай схемай планіроўкі.

А.М.Кулагін.



Станіславоўская сядзіба. Сядзібны дом.

СТАНІСЛАЎ ÁЎГУСТ ПАНЯТО́ЎСКІ (да каранацыі Станіслаў Антоні; 17.1.1732, в. Воўчын Камянецкага р-на Брэсцкай вобл. — 12.2.1798), апошні вял. князь ВКЛ і кароль Польшчы [1764—95]. Паходзіў з магнацкага роду *Панятоўскіх*. Скончыў калегіум тэатынаў у Варшаве. У 1755—64 стольнік ВКЛ. У 1755—56 і 1757—58 сакратар

СТАНІСЛАЎСКІ ЦАГЕ́ЛЬНЫ ЗАВО́Д. Дзейнічаў у 1820—1914 у маёнтку Станіславова (цяпер вёска ў Шчучынскім р-не Гродзенскай вобл.). Вырабляў цэглу, рознакаляровыя цэментавыя плiткі, бетонныя і мазаічныя прыступкі, цэментавыя і ганчарныя трубы. З 1886 размяшчаўся ў мураваным будынку. Меў паравыя машыны, паравы кацёл. У 1913 працавала 70 чал.



Станіславоўская сядзіба. З малюнка Н.Орды. 19 ст.

англійскага пасольства і пасол Саксоніі і Рэчы Паспалітай у Пецярбургу. Пасля смерці караля польскага і вял. кн. ВКЛ Аўгуста III (1763) Чартарыйскія і Кацярына II вылучылі кандыдатуру Панятоўскага на трон Рэчы Паспалітай. У Рэч Паспалітую былі ўведзены рас. войскі, і на элекцыйным сойме 6.9.1764 Панятоўскі абраны каралём. Напачатку ён спрабаваў вызваліцца ад поўнай залежнасці ад Расіі, шукаў шляхі саюзу з Аўстрыяй і Францыяй; ва ўнутр. палітыцы выступаў за пагадненне з апазіцыйнай групоўкай Патоцкіх («рэспубліканцамі»), каб адстаяць незалежнасць дзяржавы, але «рэспубліканцы» засталіся непрыхільнымі да караля. Тым не менш праводзіліся рэформы 1764—66 па ўзмацненні дзярж. улады, але былі прыпынены новай інтэрвенцыяй Расіі. Скарыстаўшы Тарунскую канфедэрацыю і *Слуцкую канфедэрацыю 1767*, Кацярына II навязала ў люг. 1768 сойму і каралю «вечны трактат», якім Расія гарантавала Рэчы Паспалітай захаванне кардынальных правоў. Улада караля апынулася пад кантролем Расіі. Шырокія колы патрыятычна настроенай шляхты выступалі за аднаўленне незалежнасці Рэчы Паспалітай, супраць караля-«узурпатара» і стварылі *Барскую канфедэрацыю*. На тэр. Рэчы Паспалітай зноў былі ўведзены рас. войскі, і канфедэраты пацярпелі паражэнне. Вынікам гэтага стаў *першы падзел Рэчы Паспалітай* (1772). Кароль спрабаваў пратэставаць, звяртаўся да еўрап. дваroў, але ніводная дзяржава не прыйшла яму на дапамогу. Пасля 1-га падзелу ў барацьбе паміж рознымі магнацкімі групоўкамі ён паступова ўзмацніў сваю ўладу. У 1775 створана *Пастаянная Рада*, прыняты рашэнні, накіраваныя на развіццё прам-сці і гандлю, паляпшэнне прававога становішча мяшчан, у 1776 абмежавана ўлада гетманаў і каралю падпарадкавана войска. Але правядзенне далейшых рэформ Расія не дазваляла. Давялося пайсці на кампраміс з Кацярынай II і прызнаць над сабой кантроль рас. пасла О.М. фон Штакельберга. Кацярыну II падтрымлівала магнацкая апазіцыя. С.А.П. адкрыў у Варшаве Рыцарскую школу (кадэцкі корпус), садзейнічаў *Адукацыйнай камісіі*, падтрымліваў асветніцтва і адукацыю. Адносная раўнавага ў паліт. жыцці Рэчы Паспалітай была пахіснута дзеяннямі новай апазіцыі, якая на *Чатырохгадовым сойме 1788—92* правяла шматлікія і грунтоўныя рэформы. Кароль пайшоў на пагадненне з рэфарматарамі. У адказ кансерватыўная групоўка магнатаў — *Таргавіцкая канфедэрацыя* — садзейнічала ў 1792 акупацыі краіны рас. войскамі. Рэформы скасаваны, кароль далучыўся да Таргавіцкай канфедэрацыі, і на яго лягла адказнасць як на капітулянта. У час *Гродзенскага сейма 1793* С.А.П. дзейнічаў цалкам пад кантролем рас. пасла Я.Я.Сіверса і пагадзіўся на *другі падзел Рэчы Паспалітай*. У час *паўстання 1794* пад кіраўніцтвам Т.Касцюшкі С.А.П. адхілены ад улады, хоць фармальна захаваў трон. Пасля паражэння С.А.П. жыў у Гродне. Тут ён даведаўся пра *трэці падзел Рэчы Паспалітай* і 25.11.1795 падпісаў акт адрачэння ад кароны на карысць Кацярыны II. Гэтым актам афіцыйна спынена існаванне Рэчы Паспалітай і яе часткі — ВКЛ. Пасля смерці Кацярыны II (ліст. 1796) Павел I выклікаў С.А.П. ў Пецярбург, дзе ён памёр. Пахаваны ў касцёле св. Кацярыны, у 1938 яго астанкі перапахаваны на радзіме — у Троіцкім касцёле мяст. Воўчын, у 1987 перавезены ў Польшчу. *А.П.Грыцкевіч.*



Станіслаў Аўгуст Панятоўскі.

СТАНІСЛА́Ў ЛЯШЧЫ́НСКІ (20.10.1677, г. Львоў, Украіна — 23.2.1766), кароль польскі і вялікі князь ВКЛ [1704—09, 1733]. Паходзіў са стараж. польскага шляхецкага роду. З 1696 выбіраўся паслом на соймы, з 1699 ваявода пазнанскі. У 1703 узначаліў апазіцыю каралю *Аўгусту II* Моцнаму. У час *Паўночнай вайны 1700—21* стаў прыхільнікам саюзу са Швецыяй і выступаў за абранне каралём Якуба Сабескага, сына Яна III Сабескага. Адзін з ініцыятараў стварэння Варшаўскай канфедэрацыі, якая 14.2.1704 абвясціла дэтранізацыю Аўгуста II і бескаралеўе. Паводле загаду шведскага караля Карла XII 12.7.1704 элекцыйны сойм абраў С.Л. на трон Рэчы Паспалітай. У С.Л. не было шматлікіх войск і прыхільнікаў. Толькі пасля паражэння Аўгуста II у Саксоніі ад войск Карла XII і яго адрачэння ад польскага трона ў 1706 С.Л. быў прызнаны каралём большасцю магнатаў у Польшчы, Літве і Беларусі. Аднак пасля *Палтаўскай бітвы 1709* прыхільнікі пачалі пакідаць С.Л., пасля чаго ён эмігрыраваў у Эльзас. Пасля смерці Аўгуста II (1733) франц. дыпламатыя вылучыла С.Л. кандыдатам на трон Рэчы Паспалітай. 12.9.1733 12 тысяч выбаршчыкаў абралі С.Л. каралём польскім і вял. князем літоўскім. Аднак Расія і Аўстрыя не пагадзіліся з гэтым. Праз Беларусь і Літву ў Варшаву прыйшла рас. армія ген.-фельдмаршала Б.К.Мініха. Пад аховаю рас. войск 5.10.1733 меншасць выбаршчыкаў абрала каралём Аўгуста III. Пачалася вайна за польскую спадчыну. У 1736 С.Л. быў вымушаны адмовіцца ад трона і зноў эмігрыраваў у Францыю. У выніку Венскага міру 1738 паміж Францыяй і Аўстрыяй, якім скончылася вайна, С.Л. атрымаў у пажыццёвае кіраванне герцагства Латарынгію і Бар пад кантролем Францыі. *А.П.Грыцкевіч.*



Станіслаў Ляшчынскі.

СТАНІСЛАЎДО́Р (франц. Stanislav d'or залаты Станіслаў, паводле ўзору франц. луідора, польск. аўгустдора), залатая манета Рэчы Паспалітай, якую выпускала ў час *паўстання 1794* Найвышэйшая нац. рада ад імя караля *Станіслава Аўгуста Панятоўскага* на Варшаўскім манетным двары. Вядомыя манеты коштам 27 і 54 злотых, з якіх, паводле меркавання большасці даследчыкаў, С — патройны чырвоны залаты (гл. *Дукат*) масай 12,34 г, а на думку некаторых сучасных навукоўцаў — паўтарачны чырвоны залаты масай 6,17 г. *І.І.Сінчук.*

СТАНІСЛА́ЎСКАГА СІСТЭ́МА, умоўная назва тэатр. тэорыі і метадалогіі сцэн. творчасці, распрацаваная К.С.*Станіслаўскім*. Практычнае кіраўніцтва ў

штодзённай працы акцёраў і рэжысёраў, эстэт. аснова сцэн. творчасці, фундамент рэаліст. мастацтва. Заснавана на свядомым авалоданні падсвядомымі творчымі працэсамі. С.с. — вынік абагульнення творчага і тэатр.-пед. вопыту самога Станіслаўскага, яго папярэднікаў і сучаснікаў. У аснову пакладзены працы А.Пушкіна, М.Гогаля, А.Астроўскага аб тэатр. мастацтве, сцэн. дасягненні М.Шчэпкіна, інш. буйнейшых акцёраў Маскоўскага Малога т-ра і асабліва драматургія, эстэтыка А.Чэхава, М.Горкага. Прынцыпы і метады С.с. фарміраваліся і правяраліся на жыццядзейнасць у Маскоўскім маст. т-ры і ў студыях пры ім. Узнікшы на аснове эксперыментаў, яна аформілася ў стройную навук. тэорыю пра сцэн. творчасць.

С.с. тэарэтычна абгрунтоўвае рэаліст. кірунак у тэатр. мастацтве, які Станіслаўскі называў «мастацтвам перажывання» і які вымагае не імітацыю пачуццяў герояў на сцэне, а сапраўднага «жыцця чалавечага духу». Аснова С.с. — вучэнне пра звышзадачу ў спектаклі і скразное дзеянне ў ролі. Звышзадача, паводле Станіслаўскага, — гал. ідэйная задача, мэта, дзеля якой ствараецца п'еса, акцёрскі вобраз, спектакль, г.зн. аснова асноў сцэн. твора. Дзейснае імкненне да дасягнення звышзадачы ажыццяўляецца скразным дзеяннем акцёра на сцэне, яго арганічным жыццём у прапанаваных аўтарам абставінах п'есы. Да элементаў акцёрскай творчасці Станіслаўскі адносіў уяўленне, увагу, здольнасць да ўзаемадзеяння, пачуццё праўды, эмацыянальную памяць, пачуццё рытму, тэхніку мовы, пластыку, у працэсе чаго ўдзельнічаюць розум, воля, пачуцці, знешнія і ўнутр. артыстычныя даныя. С.с. цесна звязана з акцёрскай тэхнікай. У 1930-я г. на аснове вучэння І.Сечанава, І.Паўлава пра вышэйшую нерв. дзейнасць чалавека Станіслаўскі адкрыў метад фіз. дзеянняў, які вядзе акцёра да авалодання ўнутр. сэнсам ролі. Пры засваенні тэксту п'есы асабліва значэнне надаецца дзеянню на сцэне словам. З 1907 і да канца жыцця Станіслаўскі працаваў над сістэмай, якая складаецца з 3 раздзелаў: «Работа акцёра над сабой у творчым працэсе перажывання», «Работа акцёра над сабой у творчым працэсе пераўвасаблення» (не закончаны), «Работа акцёра над роляю» (аб працэсе арган. зліцця акцёра з роляй, пераўвасабленні ў вобраз). Праблемы С.с. распрацаваны і ў інш. яго творах. С.с. накіравана супраць дылетантызму ў сцэн. творчасці, на сцвярджэнне жыццёвай, пісхал. праўды ў тэатр. мастацтве, метаду сцэн. рэалізму. Зрабіла вялікі ўплыў на развіццё сусв. сцэн. мастацтва.

Бел. тэатр. калектывы ў сваёй практыцы кіруюцца пераважна С.с. Акцёры Нац. акад. т-ра імя Я.Купалы засвойвалі яе метадалогію і творчыя прынцыпы ад рэжысёраў Е.Міровіча, І.Раеўскага, І.Судакова. С.с. вывучалі ў Бел. драм. студыі ў Маскве (1921—26), з выпускнікоў якой створаны Бел. т-р імя Я.Коласа. Калектыў БДТ-3 авалодваў ёю на курсах у Маскве (1933). Прынцыпамі жыццёвай верагоднасці, сцэн. рэалізму кіраваўся ў спектаклях Ф.Ждановіч. У Дзярж. ін-це тэатр. мастацтва С.с. выкладалі Л.Леанідаў, М.Тарханаў. Па ёй вядзецца навучанне акцёраў, рэжысёраў у Бел. АМ і ў інш. навуч. установах, драм. студыях.

Літ.: Станиславский К.С. Собр. соч. Т. 2—4. М., 1954—57; Режиссерские экземпляры К.С.Станиславского. Т. 1—6. М., 1980—94; Горчаков Н.М. Режиссерские уроки К.С.Станиславского. 3 изд. М., 1952; Ягo ж. К.С.Станиславский о работе режиссера с актером. М., 1958; Топорков В.О. К.С.Станиславский на репетиции: Воспоминания. М., 1950; Крыжицкий Г. О системе Станиславского. М., 1954; Калашников Ю. Театральная этика Станиславского. 2 изд. М., 1972; Кристи Г. Воспитание актера школы Станиславского. 2 изд. М., 1978; Прокофьев В.Н. В спорах о Станиславском. 2 изд. М., 1976; Кнебель М. О действенном анализе пьесы и роли. 3 изд. М., 1982.

А.В.Сабалеўскі.

СТАНІСЛА́ЎСКАЕ ВО́ЗЕРА. У Докшыцкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Сэрвач, за 23 км на З ад г. Докшыцы. Пл. 0,46 км², даўж. 930 м, найб. шыр. 650 м, найб. глыб. 2 м, даўж. берагавой лініі 2,6 км. Пл. вадазбору 42,2 км². Катлавіна рэшткавага тыпу. Схілы выш. да 2 м, на ПнУ і У да 10 м, часткова разараныя. Берагі на ПнУ і У забалочаныя, пад хмызняком, астатнія сплавінныя. Пойма шыр. 75—100 м, тарфяністая. Дно сапрапелістае, уздоўж паўн.-ўсх. берага — ілістае. Зарастае падводнай расліннасцю. Шыр. прыбярэжнай палосы з аеру, трыснягу, чароту 35—50 м. На Пн і З упадаюць меліярац. канавы.

СТАНІСЛА́ЎСКІ (сапр. Аляксееў) Канстанцін Сяргеевіч (17.1.1863, Масква — 7.8.1938), расійскі рэжысёр, акцёр, педагог, тэарэтык тэатр. мастацтва. Нар. арт. СССР (1936). Рэфарматар т-ра, заклаў фундамент навукі аб сцэн. мастацтве (гл. *Станіслаўскага сістэма*). Тэатр. дзейнасць пачаў у 1877 на аматарскай сцэне як акцёр і рэжысёр. Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў Т-ва мастацтва і л-ры (1888). Найб. поўна і ярка талент С. раскрыўся ў Маск. маст. т-ры (МХТ), які ён заснаваў з У.*Неміровічам-Данчанкам* у 1898. У першай пастаноўцы «Цар Фёдар Іаанавіч» А.К.Талстога дасягнуў гіст. праўды, акцёрскай верагоднасці, дакладнай распрацоўкі масавых сцэн. З адкрыццём новага кірунку ў сцэн. мастацтве звязаны пастаноўкі п'ес А.Чэхава «Чайка» (1898), «Дзядзька Ваня» (1899), «Тры сястры» (1901), «Вішнёвы сад» (1904, усе з Неміровічам-Данчанкам), якім уласцівы глыбокі псіхалагізм, высокая паэтычнасць, ансамблевасць ігры, зладжанасць усіх маст. кампанентаў. Грамадзянскім гучаннем вызначаліся пастаноўкі драматургіі М.Горкага «Мяшчане» і «На дне» (1902, апошняя з Неміровічам-Данчанкам). Наватарствам, дакладным прачытаннем літ. твораў адметныя спектаклі «Гора ад розуму» А.Грыбаедава (1906), «Рэвізор» М.Гогаля (1908), «Жывы труп» Л.Талстога (1911), «Дзе тонка, там і рвецца» І.Тургенева (1912, усе з Неміровічам-Данчанкам). Сац. напоўненасцю і завостранасцю, яркасцю фарбаў вызначаліся спектаклі «Гарачае сэрца» А.Астроўскага (1926), «Жаніцьба Фігаро» П.Бамаршэ (1927), «Мёртвыя душы» паводле Гогаля (1932). Вобразам, створаным С.-акцёрам, уласціва тонкая псіхал. распрацоўка (Трыгорын — «Чайка», Астраў — «Дзядзька Ваня», Вяршынін — «Тры сястры»), высокі грамадзянскі пафас (Сацін — «На дне», Штокман — «Доктар Штокман» Г.Ібсена), сатыр. завостранасць, тэатр. яркасць, кідкасць (Фамусаў — «Гора ад розуму», Круціцкі — «На ўсякага мудраца хапае прастаты» Астроўскага, Арган — «Прытворна хворы» Мальера). Вёў пед. работу ў драм. і оперных студыях. Распрацоўваў метады работы над п'есай, роляй, вёў пошукі новых шляхоў у сцэн. творчасці. З дзейнасцю С. звязаны новы кірунак ў тэатр. мастацтве, вышэйшы этап у развіцці сцэн. рэалізму. Дасягненні абгрунтаваў у тэарэт. працах. Практычная дзейнасць С., тэарэт. працы зрабілі вялікі ўплыў на сусв. сцэн. мастацтва, у т.л. на беларускае.



К.С.**Станіслаўскі**.



К.**Станіслаўскі** ў ролі Вяршыніна

Тв.: Собр. соч. Т. 1—8. М., 1954—61.

Літ.: О Станиславском: Сб. воспоминаний, 1863—1938. М., 1948; Станиславский: Писатели, артисты, режиссеры о великом деятеле рус. театра. М., 1963; Полякова Е.И. Станиславский — актер. М., 1972; Яеж. Станиславский. М., 1977; Сибиряков Н.Н. Мировое значение Станиславского. М., 1974; Виноградская И.Н. Жизнь и творчество К.С.Станиславского: Летопись. Т. 1—4. М., 1971—76; Соловьева И.Н., Шитова В.В. К.С.Станиславский. М., 1985; Сабалеўскі А. Станіслаўскі і сучаснасць // Сабалеўскі А. Жыццё тэатра. Мн., 1980.

А.В.Сабалеўскі.

СТАНІ́ЦА, 1) у Рус. дзяржаве 15—17 ст. конны атрад (60—100 чал.), які высылалі на паўд. і паўд.-ўсх. межы краіны для аховы і папярэджання нечаканага нападу праціўніка. 2) Невялікі атрад суправаджэння пасланца казацкага войска для вядзення перагавораў з інш. казацкім войскам або суседняй дзяржавай. Выраз «паслаць грамату са станіцай» азначаў паслаць грамату ў суправаджэнні атрада. 3) Дэлегацыя («пасольства») казацкага войска (16—18 ст.), якая накіроўвалася ў сталіцу Расіі для выказвання гатоўнасці служыць рус. царам, а таксама для сувязі з урадам. 4) У Расіі 17—18 ст. казацкае пасяленне, з 19 ст. адм.-тэр. адзінка і яе цэнтр у казацкіх абл., якая аб'ядноўвала некалькі хутароў і пасёлкаў; афіц. назва буйных сёл на тэр. б. казацкіх войск (у Краснадарскім, Стаўрапольскім краях, Растоўскай вобл. і інш.).

СТАНІ́ЦЫН (сапр. Гёзе) Віктар Якаўлевіч (2.5.1897, г. Днепрапятроўск, Украіна — 23.12.1976), расійскі акцёр і рэжысёр. Нар. арт. СССР (1948). Вучыўся ў 2-й Студыі Маскоўскага маст. т-ра (1918—24). З 1924 артыст Маскоўскага Маст. акад. т-ра. Мяккі лірычны акцёр. Сярод роляў: Андрэй Прозараў («Тры сястры» А.Чэхава), Кураслепаў («Гарачае сэрца» А.Астроўскага), Рапяцілаў («Гора ад розуму» А.Грыбаедава), губернатар («Мёртвыя душы» паводле М.Гогаля), Сціва Аблонскі («Ганна Карэніна» паводле Л.Талстога) і інш. Паставіў спектаклі: «Піквікскі клуб» паводле Ч.Дзікенса (1934), «Ідэальны муж» О.Уайльда (1946), «Марыя Сцюарт» Ф.Шылера (1957) і інш. Здымаўся ў кіно. Дзярж. прэміі СССР 1947, 1949, 1951, 1952. Дзярж. прэмія Расіі 1974.

СТАНІШЭ́ЎСКІ Леанід Станіслававіч (н. 17.9.1936, Мінск), бел. хімік-арганік. Д-р хім. н. (1976), праф. (1978). Скончыў БДУ (1959), дзе і працуе (у 1988—93 заг. кафедры). Навук. працы па сінтэзе біялагічна актыўных гетэрацыклічных злучэнняў. Распрацаваў новыя міярэлаксанты і рэагенты для стабілізацыі біятрансплантантаў.

Тв.: Синтез и фармакологические свойства некоторых 3,4-дигидроксипиперидинов (у сааўт.) // Химико-фармацевтич. журн. 1990. Т. 24, № 2; Синтез 3-гидрокси-3-метил-7-фенилбензо[а]хинолизин-2-онов (разам з Р.В.Пшанічным, Ву Дзінь Хаангам) // Химия гетероциклич. соединений. 1994. № 2.

СТАНКАБУДАВА́ННЕ, найважнейшая галіна *машынабудавання і металаапрацоўкі*, прадпрыемствы якой выпускаюць метала- і дрэваапр. станкі, аўтам. і паўаўтам. лініі, комплексы для вытв-сці машын і вырабаў з металу, кавальска-прэсавае і ліцейнае абсталяванне. Узровень развіцця С. вызначае навукова-тэхн. прагрэс у розных галінах *прамысловасці*, ступень тэхн. і эканам. незалежнасці краіны.

Выраб простых станкоў вядомы з даўніх часоў. Больш дасканалыя *металарэзныя станкі* з'явіліся з развіццём капіталіст. вытв-сці і прамысл. прадпрыемстваў заводскага тыпу. Уклад у С. зрабіў рус. механік і вынаходнік А.К.Нартаў (1693—1756): пабудаваў (1738) першы такарна-вінтарэзны станок з механізаваным супартам і наборам зубчастых колаў, разам з інш. майстрамі сканструяваў шэраг металарэзных станкоў (для свідравання ствалоў гармат, агрэгатных), якія ва ўмовах феад. Расіі не атрымалі шырокага выкарыстання. Спрыяльныя ўмовы для развіцця С. склаліся ў канцы 18 ст. ў Вялікабрытаніі. Англ. механік Г.Модслі ў 1790-х г. стварыў станок з мех. супартам. Перанесены з такарнага на інш. металарэзныя станкі, *супарт* даў пачатак станкам з развітым выканаўчым механізмам. Пазней асн. тыпы металарэзных станкоў сканструяваны ў ЗША, Германіі, Францыі і інш. Так, у 1820—30-х г. Э.Уітні (ЗША) распрацаваў некалькі канструкцый фрэзерных станкоў. Да 2-й пал. 19 ст. распрацаваны мадэлі фрэзерных, рэвальверных, стругальных, даўбёжных і інш. станкоў. У 1-й пал. 19 ст. вядучая роля ў сусв. С. належала Вялікабрытаніі, у 2-й пал. — ЗША. У Расіі першыя прадпрыемствы па вытв-сці металапрацоўчых станкоў — з-д Берда ў Пецярбургу (1790), Тульскі зброевы з-д (з 1815). Выпуск металарэзных станкоў у 1913 склаў 1,8 тыс. штук. У СССР як самаст. галіна С. ўтворана ў 1929. Выпуск металарэзных станкоў у 1940 павялічыўся ў параўнанні з 1913 у 32 разы. Магутная база С. створана ў пасляваенныя гады. Выпускаліся універсальныя і спец. станкі каля 3 тыс. тыпапамераў, у т.л. унікальныя (напр., такарныя для апрацоўкі вырабаў дыям. да 5 м, гарызантальна-расточныя з дыям. шпіндэля да 320 мм, станкі з лікава-праграмным кіраваннем). У 1981 выпушчаны 832 камплекты аўтам. і паўаўтам. ліній для машынабудавання і металаапрацоўкі. У сусв. С. на пач. 21 ст. аб'ём вытв-сці павялічваецца, кошт прадукцыі складае больш за 35 млрд. долараў. Лідзіруючае становішча ўстойліва займаюць ЗША, Германія, Італія, Японія, Швейцарыя, Вялікабрытанія, Францыя. Найбуйнейшым спажыўцом металарэзнага абсталявання галіны застаюцца ЗША (каля 20% сусв. аб'ёму).

На Беларусі С. развіваецца з 1920-х г., калі на мінскім металаапр. з-дзе «Энергія» (з 1961 станкабуд. з-д імя Кастр. рэвалюцыі) выпушчаны першыя 10 такарных станкоў (1927). У 1940 працавала 5 станкабуд. з-даў (у Мінску, Віцебску, Гомелі), выпушчана 6 тыс. станкоў. Пасля вайны адноўлены разбураныя і пабудаваны новыя станкабуд. з-ды, даваенны ўзровень вытв-сці станкоў перасягнуты ў 1952. Асвоены выпуск: *працяжных станкоў* (1940), адразных круглапільных і папярочна-стругальных (1947), падоўжна-стругальных (1948, гл. *Стругальны станок*), бясцэнтрава-шліфавальных (1950), *агрэгатных станкоў* (1957), балансіроўчых (1958), падоўжна-фрэзерных (1959), *свідравальных станкоў* (1960), плоскашліфавальных (1962), абразіўна-адразных (1967), *такарных станкоў* (верт. такарныя патронныя паўаўтаматы, 1970), *даўбёжных станкоў* (1973), *зубаапрацоўчых станкоў* (1973), *заточных станкоў* (1975), падоўжных фрэзерна-расточных многааперацыйных (1976). Прадпрыемствы С. выпускаюць таксама даводачныя, паліравальныя, расточныя, рэзьбаапрацоўчыя, фрэзерныя, шліфавальныя станкі (гл. адпаведныя арт.). У канцы 1970-х г. бел. станкі экспартаваліся ў 56 замежных краін, у т.л. ў Вялікабрытанію, ЗША, ФРГ, Францыю, Італію, Японію. У 1990 выпушчана 15,3 тыс. металарэзных станкоў і 280 кавальска-прэсавых машын, у 1995 адпаведна 3,4 тыс. і 230, у 2000 — 5,5 тыс. і 180. С. рэспублікі вырашае праблему ўзнаўлення вытв. фондаў ва ўмовах жорсткай рыначнай канкурэнцыі. У 1990-я г. станкабуд. прам-сцю створана і асвоена ў вытв-сці больш за 60 базавых мадэлей металарэзнага і кавальска-прэсавага абсталявання, у т.л. чатырохкаардынатны свідравальна-фрэзерна-расточны станок з лікавым праграмным кіраваннем (ЛПК) тыпу «апрацоўчы цэнтр», паўаўтамат для заточкі чарвячных фрэзаў з ЛПК (тыпу CNC), агрэгатны станок для апрацоўкі буйнагабарытных дэталей, рэзьба- і зубашліфавальныя, зубаддзелачныя станкі з прыладамі лічбавай індыкацыі, прэсавае абсталяванне з адытыўнай сістэмай кіравання і інш. Гл. таксама *Станкабудаўнічая і інструментальная прамысловасць*.

Літ.: История техники. М., 1962; Розенфельд Я.С., Клименко К.И. История машиностроения СССР. М., 1961; Костоусов А.И. Белорусское станкостроение сегодня и завтра // Промышленность Белоруссии. 1971. №11. *Дз.Ф.Усціновіч, У.М.Сацута.*

СТАНКАБУДАЎНІ́ЧАЯ І ІНСТРУМЕНТА́ЛЬНАЯ ПРАМЫСЛО́ВАСЦЬ, адна з найважнейшых галін *прамысловасці*, якая займаецца *станкабудаваннем* і вытворчасцю *інструментаў*. Спецыялізуецца на выпуску *металарэзных станкоў, дрэварэзальных станкоў, аўтаматычных ліній* для машынабудавання і металаапрацоўкі, абсталявання для *кавальска-прэсавай вытворчасці, металарэзнага інструменту, дрэварэзальнага інструменту, кавальскага інструменту, аснасткі тэхналагічнай*, абсталявання для *ліцейнай вытворчасці*, гідраапаратуры і інш.

На Беларусі развіваецца з 1920-х г. Найбуйнейшыя з прадпрыемстваў станкабудавання: *Мінскі станкабудаўнічы завод імя Кастрычніцкай рэвалюцыі, Мінскі станкабудаўнічы завод імя С.М.Кірава, Мінскі завод аўтаматычных ліній, Віцебскі станкабудаўнічы завод імя Камінтэрна, Віцебскі станкабудаўнічы завод імя С.М.Кірава, Віцебскі завод заточных станкоў, Аршанскі станкабудаўнічы завод, Гомельскі завод станочных вузлоў, Баранавіцкі завод аўтаматычных ліній.* Заводы інстр. прам-сці: *Мінскі інструментальны завод, Кобрынскі інструментальны завод «Сітама»* (у складзе Бел. інстр. ВА), *Аршанскі інструментальны завод*, Мінскі з-д спецінструменту і тэхнал. аснасткі; міжгаліновых вытв-сцей: *Гомельскі ліцейны завод «Цэнтраліт», Гомельскі завод «Гідрапрывод», Ваўкавыскі завод ліцейнага абсталявання.* Працуюць таксама *Маладзечанскі станкабудаўнічы завод, Баранавіцкі завод станкапрылад, Пінскае дзяржаўнае прадпрыемства «Кавліцмаш»* (выпускае ліцейнае і кавальска-прэсавае абсталяванне). Акрамя спецыялізаваных станкабудаван-

нем займаюцца інш. прадпрыемствы. Інструмент выпускаюць у сваіх інстр. цэхах большасць машына- і прыладабуд. з-даў. Металарэзнае абсталяванне, якое цяпер ствараецца, паводле прадукцыйнасці, дакладнасці, ступені аўтаматызацыі, сервісу і інш. паказчыкаў адпавядае ўзроўню замежных узораў. У апошнія гады створана аснова для пераходу на блочна-модульны прынцып праектавання і вытв-сці станкоў розных тэхнал. груп. Забяспечваецца павышэнне прадукцыйнасці, дакладнасці і гібкасці асн. груп металарэзнага абсталявання, ствараюцца новыя канструкцыі дапаможнага (магн. пліты, маніпулятары, спец. накапляльнікі) і кантрольна-вымяральнага абсталявання. 63 вытворцы розных форм уласнасці выпускаюць больш за 6300 тыпапамераў металарэзнага інструменту і звыш 2600 тыпапамераў абразіўнага (у т.л. на аснове звышцвёрдых матэрыялаў), што складае 58% інструментальнага сектара (29% прыпадае на вытв-сць штампаў і прыстасаванняў, 13% — на вытв-сць сродкаў вымярэння). Асн. кірункам дзейнасці інструментальнай падгаліны з'яўляецца павелічэнне ўзроўню імпартазамяшчэння. *Дз.Ф.Усцінавіч.*

СТАНКЕ́ВІЧ Адам Вікенцьевіч (6.1.1892, в. Арляняты Смаргонскага р-на Гродзенскай вобл. — 29.11.1949), бел. грамадска-паліт. дзеяч, выдавец, гісторык, публіцыст, літ.-знавец, каталіцкі святар. Канд. кананічнага права (1918). Скончыў духоўную семінарыю ў Вільні, рымска-каталіцкую духоўную акадэмію ў Петраградзе (1918). Пасвячоны ў святары ў 1914. Адзін з заснавальнікаў і лідэраў *Беларускай хрысціянскай дэмакратыі* (1917), член яе ЦК (з 1931), рэдактар-выдавец час. *«Хрысціянская думка»* (1928—39). У 1919—33 выкладчык рэлігіі ў *Віленскай беларускай гімназіі*. З 1922 пасол (дэпутат) польскага сейма, нам. старшыні *Беларускага пасольскага клуба*. У 1924—26 старшыня *Таварыства беларускай школы*, кіраўнік *Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры*. Адзін з заснавальнікаў у Вільні бел. друкарні імя Ф.Скарыны (1926—40). З 1939 старшыня Бел. цэнтра ў Літве, рэдактар газ. «Крыніца» (гл. *«Беларуская крыніца»*). У час 2-й сусв. вайны служыў у касцёле св. Міхаіла ў Вільні. У 1949 арыштаваны органамі НКУС і абвінавачаны ў антысав. дзейнасці. 31.8.1949 Асобай нарадай пры МДБ СССР асуджаны на 25 гадоў пазбаўлення волі. Зняволенне адбываў у віленскай турме Лукішкі, потым у Азярлагу (г. Тайшэт Іркуцкай вобл.), дзе і памёр. Аўтар прац па пытаннях гісторыі бел. народа («Вітаўт Вялікі і беларусы», 1930; «Кастусь Каліноўскі: «Мужыцкая праўда» і ідэя незалежнасці Беларусі», 1933; «Да гісторыі беларускага палітычнага вызвалення», 1934); нац. асветы («Беларуская мова ў школах Беларусі XVI і XVII ст.», 1928), бел. нац. адраджэння ў 19 — 1-й пал. 20 ст. («Беларускі хрысціянскі рух», 1939), хрысціянства і хрысціянска-дэмакр. руху на Беларусі [«Хрысціянства і беларускі народ: (Спроба сінтэзы)», 1940] і інш. Працаваў над кн. «Гісторыя Беларусі (сістэматычны нарыс)» (з 5 запланаваных частак да арышту напісаў толькі 2). Асабісты архіў С. захоўваецца ў Цэнтр. навук. б-цы Нац. АН Беларусі.

Літ.: Вабішчэвіч А. «... беларусы... маюць законы толькі на паперы...» // Бел. гіст. часоп. 1995. № 2; Беларускія рэлігійныя дзеячы XX ст. Мн.; Мюнхен, 1999. С. 183—184, 403—409; Конан У. Адам Станкевіч і беларускае каталіцкае адраджэнне // Роля асобы ў жыцці і дзейнасці хрысціянскіх цэркваў Беларусі ў XX ст. Мн., 2000.

А.М.Вабішчэвіч.

СТАНКЕ́ВІЧ Аляксандр Андрэевіч (у манастве Анатолій; 1821 — 6.5.1903), праваслаўны царк. дзеяч Беларусі, гісторык, публіцыст. Канд. багаслоўя (1853). З сям'і святара Мінскай епархіі. Скончыў Літоўскую духоўную семінарыю (1843), Пецярбургскую духоўную акадэмію (1853). У 1844 пасвячоны ў святара, у 1848 прыняў манаства. З 1853 інспектар Мінскай духоўнай семінарыі, у 1860—68 рэктар Полацкай духоўнай семінарыі. У 1879 настаяцель царквы рас. пасольства ў Грэцыі. З 1886 епіскап балцкі. Друкаваў свае гіст.-публіцыст. і багаслоўскія працы ў літоўскіх, мінскіх і гродзенскіх «Епархиальных ведомостях». У 1886 падараваў Пецярбургскай духоўнай акадэміі 2 пергаментныя эфіопскія рукапісы, якія былі апісаны ў час. «Христианское чтение» (1887, №5—6).

В.М.Чарапіца.

СТАНКЕ́ВІЧ Аляксандра Аляксандраўна (н. 25.12.1946, в. Вялікія Тупалы Навагрудскага р-на Гродзенскай вобл.), бел. мовазнавец. Д-р філал. н. (1997), праф. (2000). Скончыла Томскі ун-т (1968). З 1968 у Мазырскім пед. ін-це, з 1969 у Гомельскім ун-це (з 1991 заг. кафедры). Даследуе праблемы сучаснай і гіст. лексікалогіі літ. і нар.-дыялектнай мовы, пытанні стылістыкі і культуры маўлення, методыкі выкладання лінгвістычных дысцыплін у ВНУ. Аўтар манаграфіі «Лексіка іншамоўнага паходжання ў беларускіх народных гаворках» (1996), «Зборніка практыкаванняў і тэкстаў па лацінскай мове» (1978, з Н.Старасценка), «Практыкаванняў па лексіцы і стылістыцы» (1984, з В.Лящчынскай), зб. крылатых выслоўяў «Набожнае слова і антычная мудрасць крочаць побач» (1997, з У.Анічэнкам), падручніка «Лацінская мова» (1999, з С.Лін), «Слоўніка-даведніка асабовых імёнаў» (2001, з Н.Фраловай), адзін з аўтараў «Слоўніка мовы Янкі Купалы» (т. 1—3, 1997—2001) і інш.

СТАНКЕ́ВІЧ Антон Уладзіміравіч (7.7.1862, маёнтак, цяпер в. Губіна Пастаўскага р-на Віцебскай вобл. — кастр. 1919), расійскі военачальнік. Ген.-маёр (1917). Скончыў Віленскае пях. вучылішча (1880). У 1-ю сусв. вайну камандаваў палком, брыгадай, дывізіяй. З 1918 у Чырв. Арміі. У грамадз. вайну ў 1919 на Паўд. фронце: камандаваў атрадам, дывізіямі, групай войск, пам. камандуючага 13-й арміяй (чэрв.—кастр. 1919). У час баёў пад Арлом 13.10.1919 трапіў у палон да дзянікінцаў. Адмовіўся супрацоўнічаць з белагвардзейцамі і паводле прыгавору ваенна-палявога суда пакараны смерцю. Пасля разгрому белых пад Арлом цела С. перавезена ў Маскву і пахавана на Краснай плошчы каля Крамлёўскай сцяны.

СТАНКЕ́ВІЧ Гемел Міхайлавіч (8.3.1924, в. Сяліба Быхаўскага р-на Магілёўскай вобл. — 5.1.1962), Герой Сав. Саюза



А.У.**Станкевіч**.



Г.М.**Станкевіч**

(1945). Скончыў Харкаўскае танк. вучылішча (1944), Ташкенцкі юрыд. ін-т (1955). У Вял. Айч. вайну ў 1941—42 працаваў на з-дзе ў Ленінградзе, з 1944 на 1-м Укр. фронце. Камандзір танк. ўзвода мал. лейт. С. вызначыўся ў баях за г. Губен (Германія) у лютым 1945, калі ўзвод на чале з ім першы ўварваўся ў горад, экіпаж яго танка за 4 дні баёў знішчыў шмат баявой тэхнікі і жывой сілы ворага. Да 1951 у Сав. Арміі, потым на юрыд. рабоце.

СТАНКЕ́ВІЧ Іван Мікалаевіч (1829, Магілёўская губ. — 1882), вучоны ў галіне гісталогіі і фармакалогіі. Д-р медыцыны (1860). Скончыў Кіеўскі ун-т (1857). З 1861 дацэнт Кіеўскага ун-та, з 1864 дацэнт, з 1870 праф. Харкаўскага ун-та. Навук. працы па вывучэнні гісталагічнай будовы сухажылляў, лекавага ўплыву карболазотнакіслага аміяку.

СТАНКЕ́ВІЧ Мікалай Уладзіміравіч (9.10.1813, с. Удзярэўка Варонежскай вобл., Расія — 7.7.1840), расійскі грамадскі дзеяч, філосаф, паэт. Скончыў Маскоўскі ун-т (1834). З 1831 узначальваў у Маскве літ.-філас. гурток. З 1837 лячыўся за мяжой ад сухотаў, памёр у Італіі. Філас. погляды С. — разнавіднасць аб'ектыўнага *ідэалізму*. Пытанні этыкі лічыў ключавымі для вырашэння сац. праблем. Гал. прынцыпы этыкі С. — ідэя кахання як гал. пачуцця прыроды і *альтруізм*. Выступаў супраць прыгонніцтва, заклікаў да маральнага ўдасканалення і асв. дзейнасці, у чым бачыў гал. сілу гіст. прагрэсу. У вершах выказваў свае грамадска-паліт. і этычныя погляды. Спрыяў адкрыццю таленту паэта А.В.*Кальцова*, паўплываў на В.Р.Бялінскага, Ц.М.Граноўскага, І.С.Тургенева і інш.

Літ.: Манн Ю. В кружке Станкевича. М., 1983.

СТАНКЕ́ВІЧ Сяргей Леанідавіч (н. 17.1.1961, г. Слуцк Мінскай вобл.), бел. танцоўшчык. Засл. арт. Беларусі (1999). Скончыў харэаграфічнае вучылішча (1979). З 1979 у ансамблі песні і танца Балт. флоту. З 1983 у Дзярж. ансамблі танца Беларусі, адначасова з 1998 рэпетытар ансамбля. Творчасці ўласцівы характарнасць і артыстызм. Выконваў адказныя сола ў сюжэтных, пераважна жартоўных, танцах-сцэнках («Янка», «Крутуха», «Вечарына», «Вясковыя гульні» і інш.).

СТАНКЕ́ВІЧ Уладзімір Дзмітрыевіч (н. 22.8.1923, Мінск), бел. рэжысёр. Засл. дз. маст. Беларусі (1964). Скончыў Бел. тэатр. ін-т (1949). З 1950 у Рэсп. Доме нар. творчасці, у 1956—87 рэжысёр на Рэсп. студыі тэлебачання (у 1959—81 гал. рэжысёр). Сярод работ: тэлеспектаклі «Свой хлеб» Л.Арцішчава (1959), «Слова пра паэта» (1960) і «Ля сіняй бухты» (1976) Б.Бур'яна, «У хоры» Г.Леберэхта (1960), «Выпадковыя сустрэчы» Р.Назарава (1961), «4-1 = 4» А.Браілоўскага і Бур'яна (1963), «Толькі б кахаць» Р.Раманава (1966), «Машэка» Е.Міровіча (1984), «На вастрыі» К.Крапівы (1986); тэлефільмы: дакумент. «Знаёмцеся, Беларусь» (1967), «Біяграфія маёй рэспублікі» (1968, 5-я серыя), маст. «Мы — хлопцы жывучыя» (1974). Стварыў шэраг тэлеперадач з цыкла «Творчыя партрэты» пра дзеячаў тэатр. і выяўл. мастацтва Беларусі, муз. перадач «Блакітны агеньчык», рэпартажаў, трансляцый грамадска-паліт. падзей у краіне.

СТАНКЕ́ВІЧ Янка (26.11.1891, в. Арляняты Смаргонскага р-на Гродзенскай вобл. — 16.7.1976), бел. грамадска-паліт. і эмігрыцыйны дзеяч, мовазнавец, гісторык; у Вял. Айч. вайну супрацоўнічаў з ням.-фаш. захопнікамі. Д-р слав. філалогіі і гісторыі (1926). Скончыў Віленскую бел. гімназію (1921), Карлаў ун-т у Празе (1926). У 1-ю сусв. вайну ў рас. арміі. Са снеж. 1917 у Вільні, адзін з заснавальнікаў *Беларускага навуковага таварыства*, у студз. 1918 абраны ў склад *Віленскай беларускай рады*. У час польска-сав. вайны 1919—20 чл. прэзідыума *Цэнтральнай беларускай рады Віленшчыны і Гродзеншчыны, Цэнтральнай беларускай школьнай рады*. Пасол (дэпутат) польскага сейма (1928—30). З 1926 выкладчык Віленскага і Варшаўскага ун-таў. У перыяд акупацыі Беларусі ням. фашыстамі чл. Бел. нар. самапомачы, навук. аддзела Бел. цэнтр. рады, адзін з заснавальнікаў Бел. навук. т-ва ў Мінску. З 1944 у Германіі, аднавіў дзейнасць *Крывіцкага (Беларускага) навуковага таварыства* імя Скарыны. З 1949 у ЗША, удзельнічаў у працы Бел.-амер. задзіночання, Бел.-амер. звязу, выдаваў час. *«Веда»*, «Незалежнік», супрацоўнічаў з Бел. ін-там навукі і мастацтва і яго выданнем «Запісы», час. «Сяўбіт», газ. «Бацькаўшчына» (Мюнхен), «Беларус» (Нью-Йорк) і інш. Адзін з заснавальнікаў *Вялікалітоўскага (Беларускага) фонду імя Льва Сапегі*. Аўтар прац па бел. гісторыі, гістарыяграфіі, мовазнаўстве: «Месца беларускай мовы сярод іншых славянскіх моў і час яе ўзнікнення» (1930), «Час узнікнення беларускага і ўкраінскага народаў» (1931), «Крыўя-Беларусь у мінуласці» (1942), «Этнаграфічная і гістарычная тэрыторыі і граніцы Беларусі» (1953), «З гісторыі Беларусі» (1958). «Друкары Іван Хведаровіч Рагаза і Пётр Мсціслявец» (1969), «З украінскіх дачыненняў да Вялікалітвы-Беларусі» (1970), «Нарысы з гісторыі Вялікалітвы-Беларусі» (выд. 1978) і інш. Беларусь называў Крывіяй (зыходзячы з «крывіцкай» канцэпцыі этнагенезу беларусаў) ці Вялікалітвой. Расшыфраваў і транслітэраваў кітаб 17 ст. Падрыхтаваў «Беларуска-расійскі (Вялікалітоўска-расійскі) слоўнік» (выд. 1990).

Тв.: Зб. твораў. Т. 1—2. Мн., 2002.

А.М.Вабішчэвіч, У.В.Ляхоўскі.

СТАНКО́ВАЕ МАСТА́ЦТВА, творы *жывапісу, скульптуры* і *графікі*, якія маюць самаст. характар, свабодныя ад прамых утылітарных функцый і не прызначаныя для ансамбля ў якасці яго састаўной і неад'емнай часткі. Назва ад «станка», на якім ствараюцца творы С.м., — *мальберт*, скульптурны *станок*. Творы С.м. разглядаюцца адасоблена ад наваколля, іх значэнне не мяняецца ад месца, дзе яны знаходзяцца, хаця ўмовы экспанавання і асвятлення могуць спрыяць альбо перашкаджаць поўнаму раскрыццю іх якасцей. У эпоху Адраджэння, з распадам універсальных комплексаў, характэрных для сярэдневякоўя, С.м. стала адной з умоў росквіту маст. культуры. У 17—20 ст. С.м. з яго псіхалагізмам, шматграннасцю і багаццем нюансаў — асн. род маст. творчасці, вызначальны ў жыцці грамадства.

СТАНО́К у мастацтве, 1) у скульптуры — прыстасаванне для работы скульптара; стол на 3—4 ножках (вышыню можна мяняць) з круглым або квадратным шчытом, які верціцца на вертыкальнай восі або роліках. Паваротам дошкі, на якой размешчаны твор, скульптар мае магчымасць мяняць яго асвятленне і карэкціраваць выразнасць і яго ўспрыняцце з розных бакоў гледжання. 2) У жывапісе — тое, што *мальберт*.

СТАНО́К у тэхніцы, машына для апрацоўкі матэрыялаў у розных вытв-сцях. Для апрацоўкі металаў выкарыстоўваюць *металарэзныя станкі*, у тэкст. вытв-сці — *ткацкія станкі*, мех. апрацоўку драўніны выконваюць на *дрэварэзальных станках*. Ёсць С. для апрацоўкі каменю (дыскавыя, рамныя, канатныя С. ў *каменеапрацоўцы*), пластмас, інш. матэрыялаў. Часам С. наз. таксама падтрымнае прыстасаванне (напр., для замацавання гарматы, кулямёта, калясачнага кузава), прыстасаванне для чарцёжных (чарцёжны С., гл. *Чарцёжна-канструктарская тэхніка*), фатаграфавальных (*капіравальны станок*) работ і інш.

А.І.Качаргін.

СТА́НСЫ (франц. stance ад італьян. stanza літар. — памяшканне, пакой, прыпынак), невялікі лірычны верш-медытацыя, напісаны чатырохрадкоўямі, кожнае з якіх мае сэнсавую і кампазіцыйна-сінтаксічную завершанасць, адасобленасць ад іншых. С. пісалі Дж.Байран, А.Пушкін і інш. паэты 18—19 ст. У бел. паэзіі С. можна лічыць верш М.Багдановіча «...Рушымся, брацця, хутчэй»:

Рушымся, брацця, хутчэй
У бой з жыццём, пакідаючы жах,
Крыкі пужлівых людзей
Не стрымаюць хай бітвы размах...

Проці цячэння вады
Зможа толькі жывое паплыць,
Хвалі ж ракі заўсягды
Тое цягнуць, што скончыла жыць.

С. сустракаюцца ў. сучасных бел.паэтаў: А.Звонака, С.Ліхадзіеўскага і інш.

В.П.Рагойша.

СТА́НЦЫЯ (ад лац. statio стаянне, стаянка), 1) пункт прыпынку сухапутнага транспарту, часцей за ўсё чыгуначнага, які мае спец. будынкі; таксама пункт размеркавання якіх-н. трансп. сродкаў (напр., трамвайная С.). 2) Спецыяльна абсталяванае прадпрыемства, якое абслугоўвае якую-н. галіну дзейнасці на вызначанай тэрыторыі, вядзе сістэматычныя назіранні і даследаванні, напр., *метэаралагічная станцыя*, санітарна-эпідэміялагічная С. і інш.

СТА́НЦЫЯ НАВЯДЗЕ́ННЯ РАКЕ́Т, комплекс прыстасаванняў для неперарыўнага вызначэння каардынат цэлі і пушчанай да яе *ракеты*, выпрацоўкі каманд навядзення і перадачы іх на борт ракеты. Каардынаты цэлі і ракеты вызначаюцца радыёлакацыйнымі, аптычнымі, інфрачырвонымі, лазернымі і інш. прыстасаваннямі суправаджэння цэлі і ракеты (адна- і многаканальнымі).

Прыстасаванне выпрацоўкі каманд навядзення — вылічальнае прыстасаванне, якое забяспечвае фарміраванне каманд навядзення ў адпаведнасці з абраным метадам навядзення, велічынёй і напрамкам адхілення ракеты ад кінематычнай траекторыі. Перадача на борт ракеты каманд навядзення і разавых каманд, якія мяняюць рэжым работы бартавой апаратуры, робіцца па шматканальных лініях сувязі (радыёлініях, аптычных, лазерных і інш.). Для павышэння канальнасці сувязі і скарачэння часу рэакцыі выкарыстоўваюцца многафункцыянальныя С.н.р., якія забяспечваюць пошук, знаходжанне (выяўленне), дакладнае вымярэнне каардынат цэлей і ракет, аўтаматызацыю ўсіх працэсаў апрацоўкі сігналаў і кіравання палётам ракет.

П.П.Якшонак.

СТА́НЦЫЯ ПА БАРАЦЬБЕ́ З ХВАРО́БАМІ СЕЛЬСКАГАСПАДА́РЧЫХ ЖЫВЁЛ, цэнтральная вет. лячэбна-прафілактычная ўстанова ў сельскіх раёнах. Ажыццяўляе кіраўніцтва ўчастковымі вет. лячэбніцамі, вет. службамі калгасаў, саўгасаў і інш. У склад станцыі ўваходзяць групы: процізпізаатычная, вет.-сан., гінекалагічная, па незаразных хваробах. Асн. задачы: арганізацыя і правядзенне лячэбна-прафілакт. і процізаатыч-

ных мерапрыемстваў, ахова насельніцтва ад хвароб, якія перадаюцца ад жывёл чалавеку (гл. *Антрапазаанозы*).

СТА́НЦЫЯ ПЕРАЛІ́ВАННЯ КРЫВІ́ (СПК), установа аховы здароўя, якая ажыццяўляе нарыхтоўку крыві, яе перапрацоўку на кампаненты і прэпараты, выраб *кровазаменных вадкасцей*, забеспячэнне імі лячэбна-прафілакт. устаноў. Праводзіць планаванне і ўлік *донараў*, агітацыю і прапаганду донарства, кантроль якасці кансерваванай крыві і інш. *Э.В.Вальчук.*

СТА́НЦЫЯ ТЭХНІ́ЧНАГА АБСЛУГО́ЎВАННЯ, прадпрыемства для тэхн. абслугоўвання і бягучага рамонту аўтамабіляў. Бываюць універсальныя (выконваюць комплексныя работы па абслугоўванні аўтамабіляў розных марак і мадэлей) і спецыялізаваныя (абслугоўваюць пэўныя мадэлі аўтамабіляў). Аўтамаб. з-ды таксама ствараюць С.т.а. (сервісныя аўтацэнтры), дзе акрамя тэхн. абслугоўвання аўтамабіляў дадзенага з-да выконваюць іх гарантыйны рамонт, замену агрэгатаў і інш. работы.

«СТА́НЧЫКІ» (Stańczycy), польская палітычная групоўка ў Зах. Галіцыі ў 1860-я г. — 1907. Уключала пераважна памешчыкаў і вышэйшых чыноўнікаў (кракаўскія кансерватары). Назва ад выдадзенага ў 1869 паліт. памфлета «Папка Станчыка» (складаўся з лістоў, якія нібыта апынуліся ў партфелі прыдворнага блазна канца 15 — пач. 16 ст. Станчыка), скіраванага супраць хвалі патрыят. дэманстрацый у час барацьбы за аўтаномію і падпольнага руху. «С.» дамагаліся пашырэння нац. правоў у Галіцыі пры захаванні лаяльнасці да Аўстрыі. Прапагандавалі свае ідэі ў гістарыяграфіі (кракаўская школа), літ. крытыцы і філасофіі. Гал. дзеячы С. Тарноўскі, Ю.Шуйскі, С.Козьмян, М.Бабжынскі. Друкаваныя органы «Czas» («Час») і «Przegląd Polski» («Польскі агляд»). У 1907 ператворана ў Нац. правую партыю.

СТА́НЬКАВА, вёска ў Дзяржынскім р-не Мінскай вобл., на р. Рапуса, каля аўтадарог Негарэлае—Самахвалавічы і Дзяржынск—Возера. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 10 км на ПдУ ад г. Дзяржынск, 38 км ад Мінска, 12 км ад чыг. ст. Койданава. 1832 ж., 684 двары (2001). Адкрытае акц. т-ва «Еўрамост». Сярэдняя школа, школа-інтэрнат, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, аптэка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Свята-Мікалаеўская царква (1858). Брацкія магілы чырвонаармейцаў, якія загінулі ў грамадз. вайну, сав. воінаў. Магіла М.І.*Казея*. Помнік архітэктуры — *Станькаўскі сядзібна-паркавы ансамбль*.

СТА́НЬКАЎСКІ СЯДЗІ́БНА-ПА́РКАВЫ АНСА́МБЛЬ, помнік архітэктуры і садова-паркавага мастацтва 2-й пал. 19 ст. ў в. Станькава Дзяржынскага р-на Мінскай вобл. Размешчаны на раўнінным рэльефе (прамавугольны ўчастак каля 15 га) са схілам у бок штучнага вадаёма, на р. Рапуса. З захаду мяжа праходзіць па гал. вуліцы вёскі. Уключаў палац, 2 жылыя дамы, гасп. пабудовы, царкву, касцёл, парк. Захаваліся флігель, павільён (т.зв. скарбчык), жылы дом, усх. брама (часткова), альтанка, некат. гасп. пабудовы. Палац пабудаваны ў 1880 у стылі рамантызму з выкарыстаннем форм сярэдневяковай архітэктуры. Аднапавярховы П-падобны ў плане будынак з 2-яруснай вежай. Другі ярус вежы меў 4 балконы, адкуль адкрывалася кругавая паркавая панарама. Перад палацам быў невял. круглы фантан (захавалася чаша). Падземнымі пераходамі-калідорамі палац быў злучаны з флігелем (кухня), з паўн. боку — са спец. павільёнам (скарбчыкам), прызначаным для б-кі (больш за 20 тыс. тамоў, збор рукапісаў) і калекцый уладальніка сядзібы (нумізматычныя зборы, гіст. малюнкі, збор жывапісу і графікі, гравюры, стараж. абразы, зброя, рэчы дэкар.-прыкладнога мастацтва і інш.). Флігель — 1-павярховы прамавугольны ў плане будынак з 2-схільным дахам. Фасады рытмічна расчлянёны лучковымі аконнымі праёмамі, дэкарыраваны замковым каменем; вуглы і цоколь руставаныя. Скарбчык — 2-павярховы квадратны ў плане павільён з 4 вугла-вымі вежамі, нагадвае сярэдневяковы замак у мініяцюры. Вежы завершаны шатровымі галоўкамі, упрыгожаны аркатурнымі паясамі. Каля 1900 пабудаваны мураваны жылы дом у стылі неаготыкі. Двухпавярховы Г-падобны ў плане, з кароткім 2-павярховым і падоўжаным 1-павярховым крыламі. Вылучаецца паўд. фасад 1-павярховага аб'ёму, у дэкоры якога выкарыстаны пілястры, прафіляваныя ліштвы, сандрыкі. Касцёл (19 ст.) знішчаны ў пач. 20 ст. Парк (закладзены ў 1870-я г. ў сядзібе графа Э.Гутэн-Чапскага) пейзажнага тыпу з элементамі рамантызму. Пл. каля 15 га. З трох бакоў абнесены мураванай сцяной (захавалася часткова), на Пд — вял. штучны вадаём. Кампазіцыя парку пабудавана на 3 шырокіх перспектывах, якія з узвышанай часткі раскрываюцца ў бок вадаёма. У зах. частцы стаяў палац. На ПдУ ад яго пачынаўся шырокі луг, перарэзаны пратокай з 2 астравамі. На зах. в-ве стаіць альтанка — 8-калонная ратонда. Замыкала перспектыву Мікалаеўская царква (1858, засталіся руіны) на процілеглым беразе вадаёма. У 1880—90-я г. пры ўездзе ў парк з У



Станькаўскі сядзібна-паркавы ансамбль. Будынак былой бібліятэкі.



Станькаўскі сядзібна-паркавы ансамбль. Брама.



Станцыя навядзення ракет зенітнага ракетнага комплексу С-75.

пабудавана мураваная брама з вартоўняй. Брама — 3-пралётная стральчатая арка з высокай цэнтр. часткай, завершанай ступеньчатым шчытом. Сцены апрацаваны плоскімі арачнымі нішамі. У парку растуць экзоты: хвоя веймутава, піхта сібірская, вяз голы, ліпа сэрцападобная, клёны вастралісты і серабрысты, туя заходняя, каштан конскі васьмітычынкавы і інш., на в-ве перад альтанкай — адзіны ў Беларусі экзэмпляр дуба чарэшчатага ніцага. Палац разбураны ў Вял. Айч. вайну, на яго месцы пабудавана школа-інтэрнат.

А.В.Алісейчык, В.Р.Анціпаў.

СТАНЮКО́ВІЧ Канстанцін Міхайлавіч (30.3.1843, г. Севастопаль, Украіна — 20.5.1903), рускі пісьменнік. Вучыўся ў Марскім кадэцкім корпусе (1857—60). У 1860—63 у кругасветным плаванні. З 1864 у адстаўцы. За сувязь з рэв. народнікамі-эмігрантамі ў 1884 высланы на 3 гады ў Томск. Друкаваўся з 1859 (вершы). Першая кн. нарысаў «З кругасветнага плавання» (1867). Раманы «Нашы норавы» (1879), «Першыя крокі» (1891), «Жрацы» (1897), «Абыякавыя» (1899) і інш. пра драм. стан дэмакр. інтэлігенцыі, якая не знаходзіць прымянення сваім сілам і здольнасцям. У цыкле апавяданняў (зб. «Марскія апавяданні», 1888, і інш.) і аповесцях «Грозны адмірал» (1891), «Вакол свету на «Каршуне» (1895—96), «Севастопальскі хлопчык» (1902) і інш. рэалізм, дэмакратызм, пропаведзь грамадз. і асабістай мужнасці і душэўнай стойкасці. Аўтар п'ес, цыклаў нарысаў і фельетонаў. Пушкінская прэмія (1901) за «марскія» творы.

Тв.: Собр. соч. Т. 1—10. М., 1977; Морские рассказы. Кн. 1—7. М., 1980.

Літ.: Вильчинский В.П. К.М.Станюкович: Жизнь и творчество. М.; Л., 1963; Петрушков В.С. Поэтика К.М.Станюковича—мариниста: (Особенности худож. изобразительности и стиля). Душанбе, 1966.

СТАНЮ́ТА Аляксандр Аляксандравіч (н. 17.10.1936, Мінск), бел. крытык, літаратуразнавец, пісьменнік. Сын *С.М.Станюты*. Д-р філал. н. (1999). Праф. (2000). Скончыў БДУ (1960). Працаваў у газ. «Знамя юности» (1960—70). З 1973 выкладае ў БДУ. Друкуецца з 1959. Піша на бел. і рус. мовах. Даследуе праблемы ўзаемадзеяння бел. л-ры і тэатра з рус. класічнай л-рай, творчую маст. індывідуальнасць А.Адамовіча, Я.Брыля, В.Быкава, В.Казько, А.Жука, М.Стральцова і інш. Аўтар манаграфіі «Спасцiжэнне чалавека. Творчасць Дастаеўскага 1840—1860-х гг.» (1976), кнігі пра творчасць Дастаеўскага «Твар і воблік» (1999), даследавання «Талстой на беларускай сцэне» (1980), зб. літ.-крытычных артыкулаў «Плошча Свабоды» (1991), аповесці пра гар. прыватнае жыццё 1950-х г. «Мост» (1984), кнігі пра маці «Стэфанія» (1994, дап. варыянт «Жыццё актрысы», 2001), апавяданняў, нарысаў, сцэнарыяў дакумент. тэлефільмаў.

І.У.Саламевіч.

СТАНЮ́ТА Міхаіл Пятровіч (1.10.1881, г. Чэрвень Мінскай вобл. — 2.1.1974), бел. жывапісец, педагог. Бацька С.М.*Станюты*. Вучыўся ў школе малявання Я.Кругера (1908—11), Дзярж. вольных маст. майстэрнях у Маскве (1918—20). З 1920 заг. аддзела выяўл. мастацтва Галоўпалітасветы Беларусі, сакратар аб'яднання мастакоў Беларусі (з 1924), Усебел. аб'яднання мастакоў (1927—30). Выкладаў маляванне ў школах, маст. студыях і гуртках (1920—39). Адзін з ініцыятараў і арганізатараў Мінскай гар. маст. выстаўкі (1921). Працаваў у станковым жывапісе (тэматычная карціна, партрэт, пейзаж, нацюрморт), графіцы. Сюжэтна-тэматычныя карціны вызначаюцца актуальнасцю тэматыкі, выразнасцю кампазіцыі і малюнка, абагульненасцю формы, пастознасцю і колеравай насычанасцю: «Шклозавод» (1924), «Бетоншчыкі» (1927), «Будаўніцтва Універсітэцкага гарадка» (1928), «На будоўлі» (1929), «Ліцейны цэх» (1931). Значнае месца займаў партрэт: «Бежанец», «Аўтапартрэт» (абодва 1921), «Партрэт дачкі» (1923), «Партрэт мастака М.Філіповіча» (1925), «Студэнт» (1927), «Ударнік» (1928), «Беларус» (1944), «Хлопчык у кепцы» (1949), «Партрэт старога» (1952), «Калгасніца» (1961) і інш. Аўтар пейзажаў: «Прыцемкі», «Вечар» (абодва 1920), «Дарогі і хвоі» (1923), «Разбураны Мінск» (1944), «Цэнтральны сквер» (1951), «Зімой у парку» (1965).



М.**Станюта**. Партрэт дачкі. 1923.

Г.М.Ярмоленка.

СТАНЮ́ТА Стэфанія Міхайлаўна (13.5.1905, Мінск — 6.11.2000), бел. актрыса. Дачка М.П.*Станюты*. Нар. арт. Беларусі (1957). Нар. арт. СССР (1988). Скончыла Бел. драм. студыю ў Маскве (1926). Сцэн. дзейнасць пачала ў 1919 у Першым т-ве бел. драмы і камедыі. З 1920 у БДТ, з 1926 у БДТ-2, з 1931 у Нац. акад. т-ры імя Я.Купалы. Адметныя рысы творчасці С. — шырыня дыяпазону, валоданне разнастайнымі сродкамі сцэн. выразнасці, яркі пластычны малюнак роляў, эмацыянальнасць, выразнасць слова, жэста, мімікі, уменне карыстацца іроніяй, гратэскам. Стварыла шэраг нар. характараў, дзе выявіла ў сваіх гераінь мудрасць, жыццядзейнасць, шчодрасць і чалавечнасць, сувязь з роднай зямлёй: Марыля і Паланея («Раскіданае гняздо» і «Прымакі»



С.М.**Станюта**.

Я.Купалы), Алена («Салавей» З.Бядулі), Ганна Пятроўна («Простая дзяўчына» К.Губарэвіча), Рыпіна («Плач перапёлкі» І.Чыгрынава), бабуля Вера («Маладая гвардыя» паводле А.Фадзеева), Бабуля («Я, бабуля, Іліко і Іларыён» Н.Думбадзе і Р.Лордкіпанідзе), цёця Моця («Машачка» А.Афінагенава), Кармеліца («Рамэо і Джульета» У.Шэкспіра), Дуэнья («Дзень цудоўных падманаў» Р.Шэрыдана). Яркую камедыйнасць, вострую сатырычнасць спалучала з высокім драматызмам, паглыбленнем у псіхалогію шматграннага жаночага характару: Зёлкіна («Хто смяецца апошнім» К.Крапівы), пані Вашамірская («Салавей»), Куліна Чарнушка («Людзі на балоце» паводле І.Мележа), Арына Радзівонаўна («Верачка» А.Макаёнка), Каргота («Тры Іваны — тры браты» А.Вольскага), Кашкадамава («Сям'я» І.Папова), Жабрачка («Крамлёўскія куранты» М.Пагодзіна), Глафіра, Міхееўна («Ваўкі і авечкі», «Апошняя ахвяра» А.Астроўскага), Шарлота («Вішнёвы



С.**Станюта** ў ролі Арыны Радзівонаўны.

сад» А.Чэхава), Эліза («Скупы» Мальера), Дыяна («Дурная для іншых, разумная для сябе» Лопэ дэ Вэгі), Гіза («Гульня з кошкай» І.Эркеня), Бабуля («Дзверы стукаюць» М.Фермо), Мод («Гаральд і Мод» К.Хігінса і Ж.К.Кар'ер) і інш. Здымалася ў кінафільмах «Родная справа», «Цешча», «Памяць зямлі», «Трывожны месяц верасень», «Развітанне», «Белыя Росы», «Слухаю, чую», «Чужая бацькаўшчына», «Радуніца», «Мама, я жывы» і інш., тэлефільмах «Мы — хлопцы жывучыя», «Нас выбраў час», «Пра Чырвоную Шапачку», «Атланты і карыятыды», тэлеспектаклях «Людзі на балоце», «Ткачы» і інш. Дзярж. прэмія Беларусі 1982.



С.**Станюта** ў ролі Мод.

Літ.: Бушко Т. Разнапланавая актрыса: (С.М.Станюта) // Майстры беларускай сцэны. Мн., 1960; Сабалеўскі А. Шматграннасць характару // Сабалеўскі А. Жыццё тэатра. Мн., 1980; Азгур З. Актриса Стефания Станюта // Азгур З. То, что помнится... Мн., 1984. Кн. 2; Арлова Т. Гатовы ўсё аддаць — і тым багаты // Арлова Т. Купалаўцы. Мн., 1985; Станюта А. Жизнь актрисы. Мн., 2001. *В.А.Ракіцкі.*

СТАПА́, група складоў з адным націскным (доўгім) і адным або двума ненаціскнымі (кароткімі) складамі, раўнамернае паўтарэнне якіх вызначае метр сілаба-танічнай і ант. сістэм вершаскладання. С. — метрычная адзінка верша, у той час як вершаваны радок — рытмічная.

У слове можа быць адна або некалькі С.: «Вучэб/ную /стральбу /прахо/дзіла /пяхота» (К.Крапіва). Часам С. ўключае 2 словы ці заканчэнне аднаго і пачатак другога: «Бага/та, род/ная/ ты мова» (П.Броўка). У залежнасці ад колькасці складоў С. сілаба-танічнага верша бываюць 2-складовыя (*ямб, харэй*) і 3-складовыя (*дактыль, амфібрахій, анапест*).

В.П.Рагойша.

СТА́ПЕЛЬ (ад галанд. stapel), адкрытая, нахіленая да вады пляцоўка для будаўніцтва (рамонту) і спуску на ваду суднаў. Уваходзіць у склад *верфі*. Мае бетонны *фундамент* з высокімі апорамі (кільблокамі) для судна, а таксама грузападымальнае і інш. абсталяванне. Адносна размяшчэння ад берагавой лініі бываюць падоўжныя і папярочныя. Са С. судна спускаюць на ваду з дапамогай спец. прыстасаванняў.

СТАПО́ВІЧ (Стэповіч) Альбін Мацвеевіч (18.3.1894, в. Барані Астравецкага р-на Гродзенскай вобл. — 18.12.1934), бел. грамадска-паліт. і музычны дзеяч, публіцыст. Брат К.*Сваяка*. Вучыўся ў кансерваторыі Монтвіла ў Вільні, Казанскім і Віленскім ун-тах (1918—24). Адзін з заснавальнікаў Бел. каап. земляробча-прамысл. банка ў Вільні, Бел. ін-та гаспадаркі і культуры, яго сакратар, нам. старшыні (1930—34), старшыня Віленскага аддзела, кіраўнік хору пры ім. З 1926 сакратар, у 1927—30 віцэ-старшыня *Беларускай хрысціянскай дэмакратыі*, выдавец яго органа — газ. *«Беларуская крыніца»*. У 1928—30 пасол (дэпутат) польскага сейма. У 1930 нам. старшыні Бел. нац. к-та ў Вільні. Адзін з ідэолагаў бел. нацыянал-сацыялістаў (пад псеўд. Уладзімір Загорскі). Супрацоўнічаў у выданнях «Наш шлях», «Крыніца», «Беларуская крыніца», «Родныя гоні», «Нёман», «Новы шлях», «Шлях моладзі», «Самапомач» і інш. Аўтар музыкі да вершаў Я.Купалы, М.Машары, К.Сваяка, Ф.Грышкевіча, У.Казлоўскага, А.Гурло, вершаваных перакладаў з польскай мовы.

Літ.: Глагоўская А. Кар'еру пачынаў у Цеханаўцы // Спадчына. 1994. № 6.

А.Глагоўская.

СТАР, вёска ў Забалацкім с/с Аршанскага р-на Віцебскай вобл., каля аўтадарогі Орша—Лепель. Цэнтр калгаса. За 14 км на ПнЗ ад горада і чыг. ст. Орша, 9 км ад Віцебска. 225 ж., 79 двароў (2001). Пач. школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.



Стапель: 1 — спускавы фундамент; 2 — санкі; 3 — спускавая дарожка.

СТАРААБРА́ДСТВА, тое, што *старавераства*. Гл. таксама *Раскол*.

СТАРАБАРЫ́САЎ, вёска ў Барысаўскім р-не Мінскай вобл., каля р. Бярэзіна, на аўтадарозе Барысаў—Зембін. Цэнтр Прыгараднага с/с і Мінскага абл. унітарнага с.-г. прадпрыемства. За 2 км на Пн ад горада і 7 км ад чыг. ст. Барысаў, 75 км ад Мінска. 1209 ж., 489 двароў (2001). Кансервавы з-д. Сярэдняя школа і школа-інтэрнат, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Помнік архітэктуры — сядзібны дом (пач. 20 ст.). У вёсцы захавалася гарадзішча (пл. 1 га.) і селішча (3 га), дзе ў 12—13 ст. размяшчаўся пасад стараж. г. *Барысаў*, заснаванага ў 1102 князем Барысам (гл. *Рагвалод Усяславі́ч*). Пры археал. даследаваннях у 1968, 1969, 1971 тут выяўлена тыповая матэрыяльная культура полацкага горада 12—13 ст. Праз некалькі стагоддзяў з заснаваннем *Барысаўскага замка* горад перамясціўся на 4—5 км ад свайго першапачатковага месцазнаходжання і запусцелае паселішча стала называцца Старым Барысавам (цяпер Старабарысаў).

Літ.: Штыхов Г.В. Города Полоцкой земли (IX—XIII вв.). Мн., 1978; Древнерусские княжества X—XIII вв. М., 1975. С. 229.

Г.В.Штыхаў.

СТАРАБЕЛАРУ́СКАЯ МО́ВА, мова бел. народнасці ў 14—18 ст. Існавала ў вуснай нар.-дыялектнай і кніжнай літ.-пісьмовай формах.

Нар.-дыялектная С.м. ўзнікла на базе тэр. дыялектаў усх.-слав. зямель, якія ў 13—14 ст. увайшлі ў ВКЛ. Яна вызначаецца фанетычнымі рысамі: зацвярдзеннем «ч» і «р» («прычыны»), *дзеканнем* і *цеканнем*, зацвярдзеннем губных зычных на канцы слова («семъ», «голубъ»), фрыкатыўным «г», пераходам «в» і «л» у «ў» (у пэўных пазіцыях), падоўжаннем зычных у інтэрвакальным становішчы (вынік асіміляцыі «j»), супадзеннем у вымаўленні гукаў «е» і «ё», развіццём спалучэння «ры», «лы» на месцы спалучэнняў плаўных з рэдукаванымі («крываво», «блышчачися»), развіццём напружаных рэдукаваных у «і» і «ы» («злыи», «биится»), развіццём *акання* і *якання*. Граматыцы С.м. ўласціва захаванне ў словазмяняльнай парадыгме чаргаванняў заднеязычных і свісцячых, ужыванне форм старога вінавальнага склону мн.л. ў назвах жывёл, захаванне клічнай формы назоўнікаў мужчынскага і жан. роду, выцясненне кароткіх форм вышэйшай ступені прыметнікаў поўнымі, утварэнне складаных формы будучага часу з дзеясловамі-звязкамі «буду» і «маю», захаванне формы

плюсквамперфекта, замацаванне дзеепрыслоўяў на «-учы(-ючы)» і «-ачы(-ячы)», пашырэнне безасабова-пасіўнай канструкцыі з дзеепрыметнікам залежнага стану прошлага часу («мужа забіто»). У слоўнікавым складзе С.м. захаваліся некат. словы, якія выйшлі з ужытку на б.ч. ўсх.-слав. моўнай тэр. («багна», «вежа», «збожжа», «лазня» і інш.). Уласнабел. словы ўтвараліся пры дапамозе афіксаў ад агульнаслав. каранёў («пачатак», «слухач»). Узбагачэнне лексікі адбывалася за кошт запазычанняў з польскай, ням. і літ. моў («дах», «дойлід», «моц», «праца», «скарб», «фарба», «свіран» і інш.).

Нар.-дыялектная С.м. служыла сродкам штодзённых зносін бел. насельніцтва. На ёй ствараліся фалькл. творы — песні, казкі, паданні, прыказкі, прымаўкі, загадкі. Літ.-пісьмовая С.м. развівалася ў 14—15 ст. са *старажытнарускай мовы* праз насычэнне яе бел. рысамі. Яна з'яўлялася афіц. мовай ВКЛ. На працягу 15—17 ст. на С.м. створаны шматлікія і разнастайныя ў жанравых адносінах помнікі л-ры. На ёй пісаліся дакументы велікакняжацкіх канцылярый 15—16 ст.: Метрыка ВКЛ, Статуты ВКЛ 1529, 1566 і 1588, судзебнікі, дагаворы, граматы, прывілеі, інвентарныя вопісы (іх мова ў найб. ступені адпавядала тыпу жывой нар. мовы), актавыя матэрыялы судоў, гар. управаў і магістратаў, дыпламат. і прыватная перапіска. На С.м. ствараліся творы свецкай л-ры: летапісы (Віленскі, Нікіфараўскі, Акадэмічны), хронікі і хранографы (Хроніка літоўская і жамойцкая, Хроніка Быхаўца, Баркулабаўская хроніка, пераклады хронік М.Бельскага і М.Стрыйкоўскага), перакладныя аповесці («Аповесць пра Бову», «Аповесць пра Трышчана», «Гісторыя пра Атылу», «Троя», «Александрыя»). Літ. С.м. шырока ўжывалася для стварэння рэліг.-палемічнай л-ры: «Катэхізіс» С.Буднага, «Апісанне і абарона сабора рускага берасцейскага», «Дыярыуш» Афанасія Філіповіча, агіяграфічныя зборнікі 17 ст., на яе перакладзена «Евангелле» В.Цяпінскага. На аснове С.м. ўзнікла бел. кнігадрукаванне, у т.л. выданні Ф.Скарыны. Кнігі (пераважна павучальнай і прапаведніцкай л-ры) выдаваліся ў друкарнях Вільні, Еўя, Куцейна, Нясвіжа ў 2-й пал. 16 — 1-й пал. 17 ст. З узмацненнем сувязей ВКЛ з Польшчай (асабліва з сярэдзіны 17 ст.) С.м. як афіц. мова пачала выцясняцца з ужытку польскай мовай. У 18 ст. С.м. існавала толькі ў дыялектна-нар. разнавіднасці. На яе аснове ў 19 ст. адбылося станаўленне нац. *беларускай мовы*.

Літ.: Жураўскі А.І. Гісторыя беларускай літаратурнай мовы. Т. 1. Мн., 1967; Филин Ф.П. Происхождение русского, украинского и белорусского языков. Л., 1972.

А.І.Яновіч.

СТАРАБЕ́ЛІЦКАЯ МІКАЛА́ЕЎСКАЯ ЦАРКВА́, помнік драўлянага дойлідства з элементамі стылю барока ў в. Старая Беліца Гомельскага р-на. Пабудавана ў 1770-я г. Храм вырашаны 3-зрубнай падоўжна-восевай аб'ёмна-прасторавай кампазіцыяй. Да цэнтр. квадратнага аб'ёму з З і У прылягаюць 5-гранная апсіда і бабінец. Усе аб'ёмы завершаны фігурнымі галоўкамі на 6-гранных барабанах (цэнтр. — светлавы). У 19 ст. прыбудаваны прытвор і бакавыя прыдзелы. Сцены складзены з брусоў, якія звонку вертыкальна ашаляваны дошкамі з нашчыльнікамі.

С.Г.Багласаў.



Старабеліцкая Мікалаеўская царква.

СТАРАВЕ́РСТВА, рэлігійная плынь, якая ўзнікла ў 2-й пал. 17 ст. ў выніку расколу ў Рускай праваслаўнай царкве і адмовы часткі насельніцтва прызнаць царк. рэформы патрыярха Нікана. Па рэліг. дагматыцы староверы не адрозніваліся ад рэфармаванай правасл. царквы, але захоўвалі старую абраднасць: 8-канцовы крыж, 2-пальцавае хрышчэнне, двайная (сугубая) алілуя і інш., а таксама стары побыт. Падзяляліся на 2 буйныя галіны — папоўцаў і беспапоўцаў. Больш радыкальныя беспапоўцы адмовіліся ад ін-та свяшчэнства, таму афіцыйная правасл. царква лічыць гэтую плынь ератычнай, якая нібыта трапіла пад уладу антыхрыста. Прычынамі рознагалосся паміж галінамі сталі спрэчкі па пытаннях культу і адносін да ўлад. На Беларусь староверы сталі перасяляцца ў 1650-я г. з Памор'я і Ноўгарада. Беспапоўцы аселі пераважна на паўн. землях (Лепель, Полацк, Віцебск, Сянно і інш.), папоўцы пасяліліся на ПдУ Беларусі (Магілёў, Чэрыкаў, Гомель, Ветка). Апошнія былі пераважна заможныя сяляне, рамеснікі, купцы. Найбольшым пасяленнем папоўцаў і ўвогуле староверaў на Беларусі было мяст. Ветка. Царскія войскі двойчы іх адтуль выганялі. У сав. час адносіны да С. былі такімі ж, як і да інш. канфесій. На 1.1.2001 зарэгістраваны 34 абшчыны староверaў (каля 20 тыс. чал.). У 1998 зарэгістраваны Цэнтральны савет Дрэўлераваслаўнай паморскай царквы ў Рэспубліцы Беларусь.

Літ.: Гарбацкі А.А. Стараабрадніцтва на Беларусі ў канцы XVII — пачатку XX стст. Брэст, 1999.

СТАРАВО́ЙТАЎ Валерый Васілевіч (н. 6.9.1955, г. Магілёў), бел. вучоны ў галіне тэхн. кібернетыкі і інфарматыкі. Д-р тэхн. н. (2000). Скончыў БДУ (1977). З 1977 у Ін-це тэхн. кібернетыкі Нац. АН Беларусі. Навук. працы па праблемах машыннай графікі, праграмнага забеспячэння выліч. комплексаў, лічбавай апрацоўкі відарысаў. Распрацаваў мадэлі, метады і алгарытмы для аўтаматызаваных сістэм стварэння лічбавых карт, апрацоўкі і аналізу відарысаў. Прэмія Ленінскага камсамола Беларусі 1990.

Тв.: Обработка и отображение информации в растровых графических системах. Мн., 1989 (у сааўт.); Локальные геометрические методы цифровой обработки и анализа изображений. Мн., 1997.

М.П.Савік.

СТАРАВО́ЙТАЎ Васіль Канстанцінавіч (н. 13.6.1924, в. Барок Бялыніцкага р-на Магілёўскай вобл.), бел. гаспадарчы дзеяч. Двойчы Герой Сац. Працы (1966, 1984). Засл. работнік сельскай гаспадаркі Беларусі (1978). З 1957 дырэктар саўгаса «Родненскі», у 1968—97 старшыня калгаса «Рассвет» (з 1993 аграасацыяцыі) Кіраўскага р-на. Ганаровыя званні



В.К.**Старавойтаў**.



М.А.**Старавойтаў**.

прысвоены за поспехі ў развіцці жывёлагадоўлі, павелічэнні выт-сці і нарыхтовак с.-г. прадукцыі. Дэп. Вярх. Савета СССР у 1970—74, 1979—84. Дэп. Вярх. Савета БССР у 1975—80.

СТАРАВО́ЙТАЎ Іван Мацвеевіч (4.6.1903, в. Горкі Чэрыкаўскага р-на Магілёўскай вобл. — 24.5.2002), бел. вучоны ў галіне акушэрства і гінекалогіі. Д-р мед. н. (1958), праф. (1960). Засл. дз. нав. Беларусі (1966). Скончыў БДУ (1929). З 1937 у Мінскім мед. ін-це (з 1958 заг. кафедры). Навук. працы па пытаннях прафілактыкі пупочнага сепсісу нованароджаных, родаў пры папярочным размяшчэнні плода, прафілактыкі і лячэння пасляродавых хвароб, лячэння гнойных запаленняў прыдаткаў маткі, арганізацыі акушэрска-гінекалагічнай дапамогі.

Тв.: Метрейриз в акушерской практике. Мн., 1959; Беременность и роды. Мн., 1969; Очерки гнойной хирургии в гинекологии и акушерстве. Мн., 1972.

СТАРАВО́ЙТАЎ Міхаіл Антонавіч (7.6.1923, в. Якімавічы Клімавіцкага р-на Магілёўскай вобл. — 11.4.1944), Герой Сав. Саюза (1944). У Вял. Айч. вайну з 1941 на Зах., Паўд.-Зах., Сцяпным, 3-м Укр. франтах. Аўтаматчык радавы С. вызначыўся ў сак. 1944 у баях на тэр. Адэс-

кай вобл. (Украіна), дзе пасля фарсіравання Паўд. Буга на захопленым плацдарме ўдзельнічаў у адбіцці 9 контратак ворага, 5 разоў хадзіў у атаку; памёр ад ран.

СТАРАВО́ЙТАЎ Эдуард Іванавіч (н. 21.1.1950, г.п. Юраціškі Іўеўскага р-на Гродзенскай вобл.), бел. вучоны ў галіне буд. механікі. Д-р фіз.-матэм. н., праф. (1991). Скончыў Маскоўскі ун-т (1971). З 1980 у Бел. ун-це транспарту (з 1987 заг. кафедры). Навук. працы па механіцы цвёрдага цела, праблемах разліку слаістых элементаў інж. канструкцый, што працуюць ва ўмовах складаных уздзеянняў сілавых, цеплавых і радыяцыйных палёў. Аўтар навуч. дапаможнікаў для ВНУ.

Тв.: Сопротивление материалов. Гомель, 1999; Основы теории упругости, пластичности и вязкоупругости. Гомель, 2001.

СТАРАВО́ЛЯ, вёска ў Пружанскім р-не Брэсцкай вобл., на аўтадарозе Пружаны—Шарашова. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 10 км на З ад г. Пружаны, 95 км ад Брэста, 22 км ад чыг. ст. Аранчыцы. 687 ж., 275 двароў (2001). Базавая школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан, помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

СТАРАГРА́Д, вёска ў Кармянскім р-не Гомельскай вобл., на р. Добрыч, каля аўтадарогі Карма—Доўск. Цэнтр сельсавета і камунальнага с.-г. унітарнага прадпрыемства. За 16 км на З ад г.п. Карма, 90 км ад Гомеля, 44 км ад чыг. ст. Рагачоў. 381 ж., 122 двары (2001). Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

СТАРАДАРО́ЖСКАЕ ПАТРЫЯТЫ́ЧНАЕ ПАДПО́ЛЛЕ ў Вялікую Айчынную вайну. Дзейнічала з ліп. 1941 у Старадарожскім р-не Мінскай вобл. пад кіраўніцтвам камандавання партыз. атрада «Народныя мсціўцы» (з чэрв. 1942) і Старадарожскага райкома КП(б)Б (з сак. 1943). Складалася з 8 груп (150 чал.): у г. Старыя Дарогі (кіраўнікі М.Н.Белы, В.І.Цераховіч, А.І.Шуба), вёсках Горкі (М.К.Ільінчык), Залужжа (І.І.Рабцаў, А.Я.Шчыткавец), Навасёлкі (П.К.Грынкевіч, В.Я.Мельнік, Р.І.Ручан), Пал'яменец (С.М.Раманчук), Слабодка (І.І.Жукавец), Солан (С.Ю.Доўнар, М.А.Коршун), Урбанаўка (У.І.Івашка, В.Ф.Кнарус). Падпольшчыкі прымалі па радыё і распаўсюджвалі зводкі Саўінфармбюро, збіралі для партызан зброю і боепрыпасы, медыкаменты, пісчую паперу, прадукты харчавання, адзенне, бланкі дакументаў акупац. улад, разведданыя пра ўзбраенне нямецкага гарнізонаў, перамяшчэнні войск і ваен. грузаў ворага, яго карныя аперацыі, учынялі дыверсіі, уцёкі сав. ваеннапалонных. На працягу 1942—43 большасць падпольшчыкаў пайшла ў партызаны, да падыходу Чырв. Арміі дзейнічалі групы ў Навасёлках і Старых Дарогах. За час дзейнасці загінулі 12 падпольшчыкаў.

Літ.: Беларусь ў Вялікай Айчыннай вайне, 1941—1945: Энцыкл. Мн., 1990. *Ю.А.Каліца.*

СТАРАДАРО́ЖСКІ МАСТА́ЦКІ МУЗЕ́Й. Засн. ў 1990, адкрыты ў 1999 у г. старыя Дарогі Мінскай вобл. Пл. экспазіцыі 500 м^2, звыш 3 тыс. экспанатаў асн. фонду (2002). Аснову калекцыі складае асабісты збор калекцыянера А.Я.*Белага* (творы мастакоў Г.Вашчанкі, А.Лось, А.Марачкіна, В.Цвіркі, Г. і Я. Ціхановічаў, Л.Шчамялёва; скульптараў С.Вакара, У.Летуна, А.Шатэрніка і інш.). Сярод экспанатаў: партрэты дзеячаў нац. культуры і інш. знакамітых асоб Беларусі (Ефрасінні Полацкай, Кірылы Тураўскага, М.Гусоўскага, Т.Касцюшкі, К.Каліноўскага, С.Буднага, В.Дуніна-Марцінкевіча, Ф.Багушэвіча, Цёткі, Ядвігіна Ш., Я.Лучыны, І. і А. Луцкевічаў, В.Ластоўскага, К.Каганца, Л.Геніюш і інш.); каля 100 твораў, прысвечаных Ф.Скарыне, больш за 100 партрэтаў полацкіх князёў, вял. князёў і дзярж. дзеячаў ВКЛ (Усяслава Брачыславіча, Віценя, Гедзіміна, Альгерда, Кейстута, Ягайлы, Жыгімонта I Старога, князёў Алелькавічаў, Радзівілаў, Храптовічаў і інш.); 70 палотнаў, прысвечаных паўстанню 1863—64; партрэты дзеячаў бел. замежжа (М.Забэйды-Суміцкага, Я.Запрудніка, З. і Я. Кіпеляў, Б.Кіта, А.Надсона і інш.), сучасных дзеячаў нац. бел. гісторыі, культуры і мастацтва; радаводы князёў Беларусі; графічныя работы мастакоў М. і У. Басалыгаў, А.Кашкурэвіча, М.Купавы, М.Селешчука і інш. да твораў А.Адамовіча, В.Быкава, М.Гусоўскага, У.Караткевіча, А.Лойкі, І.В.Гётэ; плакаты бел. мастакоў; вырабы разьбы па дрэве; збор медальернага і дэкар.-прыкладнога мастацтваў, вышыванкі. Каля будынка музея ўстаноўлены помнікі А.Багдановічу, М.Багдановічу, А.Бярозку, Л.Геніюш, М.Улашчыку, у гонар Грунвальдскай бітвы 1410. *А.І.Валаховіч.*

СТАРАДАРО́ЖСКІ РАЁН. Размешчаны на ПдУ Мінскай вобл. Утвораны 17.7.1924, скасаваны 25.12.1962, адноўлены 30.7.1966. Пл. 1,4 тыс. км^2. Нас. 25 тыс. чал. (2002), гарадскога 48%. Сярэдняя шчыльн. 18 чал. на 1 км^2. Цэнтр — г. *Старыя Дарогі*. Уключае 89 сельскіх населеных пунктаў, 8 сельсаветаў: Дражнаўскі, Новадарожскі, Палажэвіцкі, Пасецкі, Паськавагорацкі, Старадарожскі, Шчыткавіцкі, Языльскі.

Тэр. раёна ў межах *Цэнтральнабярэзінскай раўніны*. Паверхня пласкахвалістая з марэннай градой на З. Пераважаюць выш. 150—170 м (65%), 25% — на выш. да 150 м. Найвыш. пункт 201 м (на ПнЗ ад в. Падарэссе). Агульны нахіл тэрыторыі з Пн на Пд. Карысныя выкапні: торф, буд. пясок, пясчана-жвіровы матэрыял, цагельныя гліны і суглінкі, мінер. вада. Сярэдняя т-ра студз. -6,4 °С, ліп. 18,2 °С. Ападкаў 632 мм за год. Вегетац. перыяд 191 сут. Найб. р. Арэса з прытокамі Таліца, Солан з Салянкай, Асвіца, прытокі р. Пшч: Арыжня, Нямегля, Даколька са Сноўкай. Воз. Скачальскае, вадасховішчы: Ляўкі, Любанскае (частка). Меліярац. каналы: Добрынскі, Добрынка, Ляўкоўскі, Прусінскі, Сінягоўскі, Слаўкавіцка-Ямінскі, канава Казённая. Пераважаюць глебы с.-г. угоддзяў: тарфяна-балотныя (34,7%), дзярнова-падзолістыя забалочаныя (30,1%), дзярнова-падзолістыя (22%), дзярновыя і дзярнова-карбанатныя забалочаныя (12,1%). Пад лесам 52% тэр. раёна. Лясы хваёвыя, бярозавыя, яловыя, чорнаальховыя, дубровы і інш. Штучных хваёвых насаджэнняў — 19,4%. Найб. лясны масіў на Пд. Пад балотамі 1,3% тэрыторыі, найб. балоты: Шчыткавіцкія Лугі, Рэчкі Алес, Мядзведня, Фаліцкі Мох, Ліпніцкі Бор. У межах раёна заказнікі рэсп. значэння: біял. — *Фаліцкі Мох*, бітумінознай сыравіны — Скачальскае возера; мясц. значэння: участкі росту чарамшы (кварталы № 32 і 34 у Старадарожскім лясніцтве), Мікуліна-Мядынскае радовішча. Помнік прыроды мясц. значэння — валун з в. Аляксандраўка, устаноўлены ў г. Старыя Дарогі ў гонар 410-годдзя заснавання горада.

Агульная пл. с.-г. угоддзяў 54 тыс. га, з іх асушаных 31,3 тыс. га. На 1.1.2002 у раёне 15 калгасаў, 1 саўгас, 8 фермерскіх гаспадарак. Сельская гаспадарка спецыялізуецца на мяса-малочнай жывёлагадоўлі, свінагадоўлі, вытв-сці кармоў. Вырошчваюць збожжавыя, зернебабовыя і кармавыя культуры, бульбу, рапс, лён, агародніну. Прадпрыемствы харч. (масла жывёльнае і жывёльнарасл. ўсіх відаў, казеін, цэльнамалочныя, хлебабулачныя і кандытарскія вырабы, спірт-сырэц, плодаагароднінныя кансервы, сокі), лёгкай (швейныя тавары) прам-сці; лясгас (дрэваапрацоўка, піламатэрыялы), лесапункт Асіповіцкага леспрамгаса (нарыхтоўка і вывазка хлыстоў), мех. з-д (камплектуючыя для прадпрыемстваў мін-ваў сувязі і абароны, тавары нар. ўжытку). На тэр. раёна праходзяць чыгунка Слуцк—Асіповічы і аўтадарогі Слуцк—Бабруйск, Баранавічы—Асіповічы, Асіповічы—Любань і інш. У раёне 14 сярэдніх, 3 базавыя, 2 пач. школы-сады, завочная сярэдняя школа, дзіцячы дом, дзіцяча-юнацкі клуб фіз.



падрыхтоўкі, міжшкольны вучэбнавытв. камбінат, раённы цэнтр рамёстваў, дзіцячая школа мастацтваў, раённы цэнтр дзіцячай творчасці, 19 дашкольных устаноў, раённы палац культуры, 12 дамоў культуры, 12 клубаў, 31 б-ка, 4 бальніцы, паліклініка, амбулаторыя, 21 фельч.-ак. пункт, дзіцячы аздараўленчы лагер «Крынічка». Раённы гіст.-этнагр. музей, прыватны маст. музей (фонд А.Я.Белага). Помнікі архітэктуры: Свята-Георгіеўская царква (на мяжы 19—20 ст.) у в. Залужжа, паштовыя станцыі (2-я пал. 19 ст.) у вёсках Паськовы Горкі і Старыя Дарогі, ч. будынка Спаса-Праабражэнскай царквы (сярэдзіна 19 ст.) у в. Языль. Выдаецца газ. «Навіны Старадарожчыны».

Г.С.Смалякоў, М.У.Татур.

СТАРАДАРО́ЖСКІЯ ДРЭВААПРАЦО́ЎЧЫЯ ПРАДПРЫЕ́МСТВЫ. Дзейнічалі на чыг. ст. Старыя Дарогі (цяпер горад у Мінскай вобл.): у 1894—1926 дрэваапрацоўча-лесапільны, з 1904 фанерны з-ды. Выраблялі дошкі, брусы, фанеру. Мелі паравыя машыны, паравы кацёл, лакамабілі. Працавала ад 20 да 180 чал.

СТАРАДВО́РСКАЕ ВАДАСХО́ВІШЧА. У Пастаўскім р-не Віцебскай вобл., за 1,2 км на ПдЗ ад в. Дземяшы. Створана ў 1982 плацінай на ручаі без назвы (бас. р. Шурыца), які ўпадае ў Старадворскае возера. Пл. 0,3 км^2, даўж. 2,6 км, найб. шыр. 450 м, найб. глыб. 8,5 м, аб'ём вады 1,1 млн. м^3. Ваганні ўзроўню вады на працягу года да 4 м. Выкарыстоўваецца для арашэння с.-г. угоддзяў, рыбаводства, адпачынку.

СТАРАДВО́РСКІ ВАЛУ́Н, геалагічны помнік прыроды рэсп. значэння (з 1992). Размешчаны за 400 м на ПдУ ад в. Стары Двор Браслаўскага р-на Віцебскай вобл. Шэры дробназярністы граніт. Даўж. 3,8 м, шыр. 2,2 м, выш. 0,5 м, у абводзе 9 м, аб'ём 2,2 м^3, маса каля 6 т. Прынесены ледавіком 20—18 тыс. г. назад са Скандынавіі. На верхняй плоскасці захаваліся 7 выемак дыяметрам 4—5 см, глыб. 0,5—2 см, якія зроблены чалавекам каля 2—2,5 тыс. г. назад. Размеркаванне ямак нагадвае люстраны адбітак малюнка сузор'я Вял. Мядзведзіцы. У старажытнасці меў культавае значэнне.

В.Ф.Вінакураў.

СТАРАДЗЕ́ТКА Яўген Аляксандравіч (н. 1.4.1933, г. Барысаў Мінскай вобл.), бел. вучоны ў галіне тэхн. кібернетыкі. Д-р тэхн. н. (1976), праф. (1988). Скончыў Ленінградскі політэхн. ін-т (1957). З 1977 у Ін-це тэхн. кібернетыкі Нац. АН Беларусі. Навук. працы па тэорыі сістэм аўтаматызаванага праектавання, выліч. геаметрыі і машыннай графікі, тэорыі рухавікоў унутр. згарання (РУЗ). Распрацаваў метады сінтэзу аўтаматызаваных працэсаў праектавання і канструявання ў машынабудаванні, пабудовы нелінейных геам. мадэлей, матэм. апісання лекальных паверхняў, якасна новы прынцып работы РУЗ.

Тв.: Математическое моделирование лекальных поверхностей. Мн., 1984; Элементы вычислительной геометрии. Мн., 1986; Супердвигатель. Мн., 1997 (у сааўт.).

М.П.Савік.

СТАРАДРУКАВА́НАЯ КНІ́ГА, старадрукі, умоўная назва кніг, выдадзеных у пэўнай краіне на працягу некат. перыяду пасля ўзнікнення ў ёй *кнігадрукавання*. Храналагічныя рамкі ўжывання тэрміна «С.к.» ў розных краінах не супадаюць. Зах.-еўрап. кнігі, выдадзеныя ў 15 ст., называюць *інкунабуламі*, кнігі 1-й пал. 16 ст. — *палеатыпамі*. У Расіі старадрукамі называюць кнігі 16—17 ст. (зрэдку і 18 ст.). Кнігі першага ўсх.-слав. і бел. першадрукара Ф.Скарыны, С.к. кірыліцкага шрыфту, выдадзеныя на Беларусі ў 16—18 ст., улічаны ў паказальніках «Бібліяграфічны спіс беларускіх старадрукаваных выданняў XVI—XVIII стст.» (складальнік Г.Я.Галенчанка, 1961), «Каталог беларускіх выданняў кірыліцкага шрыфту XVI—XVII стст.» (складальнік В.І.Лук'яненка; вып. 1—2, 1973—75), «Кніга Беларусі» (1986). Апісанню ўсх.-слав. старадрукаў прысвечаны каталогі выданняў кірыліцкага шрыфту, складзеныя кнігазнаўцамі А.С.Зёрнавай, І.В.Паздзеевай, Я.Л.Неміроўскім, Ю.А.Лабынцавым, Я.Дз.Ісаевічам, Т.А. Быкавай і інш. С.к., выдадзеныя на Беларусі на замежных мовах, найб. шырока прадстаўлены ў «Польскай бібліяграфіі» К.Эстрэйхера. С.к. збіраюцца, зберагаюцца і навукова апрацоўваюцца ў многіх б-ках свету. На Беларусі самыя вял. калекцыі старадрукаў захоўваюцца ў Нац. б-цы Беларусі і Цэнтр. навук. б-цы імя Я.Коласа Нац. АН Беларусі.

Л.І.Збралевіч.

СТАРАДУ́БСКАЕ КНЯ́СТВА, удзельнае княства ў ВКЛ і Маскоўскай дзяржаве. Утворана ў 1454 як удзел Івана Андрэевіча Мажайскага (гл. *Мажайскія*), уцекача ад вял. маскоўскага кн. Васіля II. У 1499 яго сын Сямён, які пачаў звацца кн. Старадубскім, атрымаў ад вял. кн. ВКЛ Аляксандра пацвярджэнне на вотчыну, у якую ўваходзілі Старадуб, Гомель, Чарнігаў, Бранск, Карачаў, Хоцімль. Вясной 1500 Сямён і ўладальнік Ноўгарад-Северскага княства В.І.Шамяціч перайшлі на бок вял. маскоўскага кн. Івана III. Пры гэтым іх княствы захавалі на пэўны час унутр. аўтаномію. У 1-й чвэрці 16 ст. існаванне гэтых буферных утварэнняў, якія разам з Разанню засланялі ўласна маск. тэрыторыю ад тат. набегаў, з тактычных меркаванняў дапускалася Масквой. У 1518 С.к. перайшло да вял. маскоўскага кн. Васіля III. Гомель з акругай вернуты ў склад ВКЛ у выніку *вайны Маскоўскай дзяржавы з Вялікім княствам Літоўскім 1534—37.*

А.В.Белы.

СТАРАЖЫ́ТНАГА МІЖЗЕ́М'Я БІЯГЕАГРАФІ́ЧНАЯ ВО́БЛАСЦЬ, фларыстычная і зоагеагр. вобласць сушы. Знаходзіцца на Пн ад Паўн. тропіка, ахоплівае арыдныя і субарыдныя зоны вакол



Да арт. **Старажытнага Міжзем'я біягеаграфічная вобласць**. Характэрныя прадстаўнікі фауны: 1 — як; 2 — гюрза; 3 — снежны барс; 4 — лапатанос; 5 — чарнацелка-стэрнодэс; 6 — жамчужная яшчарка; 7 — грэчаская чарапаха; 8 — блакітная сарока; 9 — пячорная саламандра; 10 — матыль-архон; 11 — шаўкапрад ізабелы; 12 — фенек.

Міжземнага м. і ў Сярэдняй і Цэнтр. Азіі. Уваходзіць у царства *Арктагею*, падцарства Палеарктычнае. 2 падвобласці: Міжземнаморская і Сахара-Гобійская. Лета сухое, што абумовіла развіццё пустынь ад Паўн. Афрыкі да Цэнтр. Азіі, ападкі пераважна ў халодны перыяд года.

Ф л о р а на 3 вобласці (вакол Міжземнага м.) складаецца з вечназялёных цвердалістых лясоў, ксерафітных кустоў і паўкусцікаў, т.зв. маквіс і таміляры. У паўпустынях і пустынях трапляюцца ксерафільныя паўкусцікі (палыны, салянкі, парналіснік) і дрэвападобныя расліны (саксаулы, пясчаная акацыя), у зімова-асенні перыяд — эфемероіды (мятлічцы, цыбулі, цюльпаны, ферулы) і эфемеры (каласоўнікі, крынічнікі, малькольмііі). У ф а ў н е пераважаюць віды адкрытых ландшафтаў. З млекакормячых пашыраны сям. селявіневых, тушканчыкавых, пясчанкі; грызуны, гіенавыя, каты (стэпавы, барханны, манул, каракал); капытныя — асёл, горны баран, антылопы, лань; шматлікія лятучыя мышы. З птушак пашыраны рабкі, дрофы, жаваранкі, пустынная сойка, юркі, саракушы, валасянкі, каменкі; у гарах — грыфы, горная курапатка; на вадаёмах — пеліканы і фламінга. Сярод паўзуноў — пераважна сям. геконаў (ёсць эндэмікі), агамавых і сапраўдных яшчарак, каля 10 відаў змей, вужы (ёсць эндэмікі), полазы. Сярод земнаводных — эндэмічныя віды трытонаў, сапраўдных жаб, еўрап. пратэй, сапраўдныя саламандры. З рыб пашыраны карпавыя, ласосевыя, асятровыя, эндэмічны род самоў. Беспазваночныя: скарпіёны, сальпугі, павукі-тарантулы і інш. Шмат родаў насякомых. *Л.В.Кірыленка.*

СТАРАЖЫТНАГРЭ́ЧАСКІЯ ЛАДЫ́, сістэмы меладычных *ладоў* стараж.-грэч. музыкі, засн. на *тэтрахордах*. Паводле інтэрвальнага складу тэтрахорды падзяляюцца на дыятанічныя, храматычныя і энгарманічныя. У дыятанічных тэтрахордах у залежнасці ад размяшчэння вял. і малых секунд (гл. *Інтэрвал*) адрозніваюць дарыйскія, фрыгійскія, лідыйскія. У выніку аб'яднання тэтрахордаў (злітнага ці раздзельнага) утвараліся больш складаныя, у т.л. актаўныя, лады (гл. *Натуральныя лады*). Лады, як і рытмы, лічыліся носьбітамі пэўнага характару.



Літ.: Античная музыкальная эстетика. М., 1960; Г е р ц м а н Е. Античное музыкальное мышление. Л., 1986. *Т.А.Дубкова.*

СТАРАЖЫТНАРУ́СКАЯ ДЗЯРЖА́ВА, гл. *Кіеўская Русь.*

СТАРАЖЫТНАРУ́СКАЯ МО́ВА, агульнаўсходнеславянская мова, агульная мова *ўсходніх славян* 10—14 ст. Сфарміравалася ў эпоху стварэння стараж.-рус. дзяржавы на базе дыялектаў усх.-слав. плямён, што вылучыліся ў выніку распаду *праславянскай мовы*. З яе вылучыліся старарус., стараўкр. мовы і *старабеларуская мова*, на аснове якіх сфарміраваліся 3 усх.-слав. роднасныя мовы: *беларуская мова*, *руская мова* і *ўкраінская мова*.

Перыяд моўнага адасаблення ўсх. славян адзначаны развіццём тых моўных асаблівасцей, якія выразна акрэслівалі і выдзялялі ўсх. групу слав. племянных дыялектаў. Гэта першае паўнагалоссе: стараж.-рус. «борода» праслав. *borda, «голова» < *glova і інш. (параўн. балг. «брада», «глава»; польск. «broda», «głova»). Развіццё гукаў «ч'», «ж'» на месцы агульнаслав. спалучэнняў tj, dj або kt, gt перад галоснымі пярэдняга ладу («свѣча» < *svetja, «межа» < *medja, «ночь» < *nokt і інш. (параўн. балг. «свеща», «межда», «нощ»; польск. swiecą, miedza, noc). З'яўленне гукаў «ў», «'а» як рэфлексаў агульнаслав. насавых галосных: «судъ» < *sądъ, «мясо» < *męso (параўн. чэш. soud, maso, польск. *sąd, mięso). Усх.-слав. моўная зона адасаблялася таксама за кошт фарміравання ў той час спецыфічнай усх.-слав. лексікі: «логъ», «семья»: «бѣлка», «собака», «утъка», «ковьръ», коврига», «лапътъ», «чара», «вира» і інш. Фанетычная сістэма С.м. характарызавалася дзеяннем закону адкрытага складу, наяўнасцю рэдукаваных гукаў «ь» і «ъ», дыфтангічнага гука «ѣ» (абазначаўся літарай ѣ), няпоўным проціпастаўленнем звонкіх—глухіх, мяккіх—цвёрдых зычных, адсутнасцю гука «ф», дыялектнай варыянтнасцю гукаў «г» (выбухнога або фрыкатыўнага) і «в» (губна-губнога або губна-зубнога). У грамат. ладзе С.м. вызначалася мнагатыпнасцю іменнага скланення (у залежнасці ад тыпаў праслав. іменных асноў, напр.: «братъ — брата», «сынъ — сыну», «дьнь — дьне», «гость — гости»); наяўнасцю форм адз., мн. і парнага ліку, 4 формамі прошлага і 3 формамі будучага часу, поўнай парадыгмай форм загаднага ладу. С.м. ўласціва «дапасаванне паводле сэнсу» дзейніка і выказніка, шырокае ўжыванне беспрыназоўнікавых канструкцый, недастатковае развіццё злучнікавых сувязей у структуры складанага сказа. На працягу 12—13 ст. дыялектнае чляненне С.м. паглыбілася ў сувязі са значным аслабленнем цэнтралізаванай стараж.-рус. дзяржавы. У выніку агульнаўсх.-слав. працэсу падзення рэдукаваных узнікаюць новыя дыялектныя адрозненні, якія проціпастаўляюць паўн. і паўн.-ўсх. землі паўд. і паўд.-заходнім. Да 14 ст. адбылося паліт. і эканам. адасабленне зах. і паўд.-зах. зямель, якія ўвайшлі ў ВКЛ, паўн. і паўн.-ўсх. землі аб'ядналіся ў складзе Маскоўскай дзяржавы.

Пісьмовыя помнікі С.м. вядомы з сярэдзіны 11 ст. З 10 ст. дайшлі толькі асобныя надпісы на прадметах, а таксама дагаворы Русі з Візантыяй (захаваліся ў складзе «Аповесці мінулых гадоў» у спісе 14 ст.). Значную ролю ў станаўленні літ. С.м. адыграла *старабеларуская мова*. Найб. адчувальны яе ўплыў на мову рэліг.-павучальных твораў («Сказанне пра Барыса і Глеба», «Жыціе Феадосія Пячэрскага», творы мітрапаліта Іларыёна, Кірылы Тураўскага). Мова «Слова аб паходзе Ігаравым», «Задоншчыны», «Малення Данііла Заточніка», летапісаў вызначаецца сінкрэтызмам стараслав. і стараж.-рус. моўных сістэм. Мова дзелавой пісьменнасці («Руская праўда», дагаворы і духоўныя граматы) у большай меры апіралася на нар.-размоўны варыянт С.м., які найб. выразна адлюстраваўся ў берасцяных граматах.

Літ.: О б н о р с к и й С.П. Очерки по истории русского литературного языка старшего периода. М.; Л., 1946; Ф и л и н Ф.П. Образование языка восточных славян. М., 1962; Я г о ж. Происхождение русского, украинского и белорусского языков. Л., 1972; Л а р и н Б.А. Лекции по истории русского литературного языка (X — середина XVIII в.). М., 1975. *А.І.Яновіч.*

СТАРАЖЫТНАЯЎРЭ́ЙСКАЯ МО́ВА, гл. *Іўрыт.*

СТАРАЖЫ́ТНЫ СВЕТ, прынятае ў гістарыяграфіі абазначэнне першага і найб. працяглага перыяду ў гісторыі чалавецтва ад пачатку фарміравання грамадства (800—100 тыс. да н.э.) да пачатку сярэдневякоўя (першыя ст. н.э.). Ахоплівае 2 перыяды: першабытнага грамадства і стараж. дзяржаў (Стараж. Усход і *антычнасць*). У сучаснай гіст. навуцы ў больш вузкім сэнсе С.с. — стараж. *цывілізацыі*. Навука, якая вывучае С.с., — стараж. гісторыя, а таксама спец. гіст. дысцыпліны: гісторыя Стараж. *Грэцыі*, гісторыя Стараж. *Рыма*, *асірыялогія*, *егіпталогія*, *індалогія*, *іраністыка*, *семіталогія*, *сіналогія*, *усходазнаўства*, *хеталогія* і інш. У часы антычнасці пад старажытнасцю разумелі паданні і міфы пра подзвігі багоў і герояў. У сярэдневякоўі ў развіцці чалавецтва вылучалі 2 эпохі — язычніцтва і хрысціянства. Паняцце стараж. гісторыі з'явілася і пачало набываць сучасны змест у эпохі Адраджэння і Асветніцтва. У 18—19 ст. С.с. вывучаўся гал. чынам праз творы ант. аўтараў. З 2-й пал. 19 ст. новыя звесткі пачалі прыносіць археал., этнаграфічныя і інш. даследаванні. Сучасная гісторыя С.с. вылучае 2 гал. групы цывілізацый — Усходу і Захаду і вывучае іх механізм і развіццё. *А.Г.Зельскі.*

«СТАРАЖЫ́ТНЫЯ ДАКУМЕ́НТЫ ПА ГІСТО́РЫІ ПО́ЛЬШЧЫ, ЛІТВЫ І СУСЕ́ДНІХ КРАІ́Н» («Vetera monumenta Poloniae et Lithuaniae gentiumque finitimarum historiam illustrantia»), археаграфічнае выданне дакументаў з Ватыканскага архіва па гісторыі Польшчы і ВКЛ 11—18 ст. Падрыхтавана гісторыкам царквы А.Тайнерам, выдадзена ў 4 тамах у Рыме ў 1860—64. Змешчаны лісты рымскіх пап да каралёў Польшчы і вял. князёў ВКЛ, вял. магістраў Нямецкага ордэна, біскупаў, абатаў і інш. асоб

у гэтых краінах, інструкцыі папскім нунцыям у Польшчы і Рэчы Паспалітай і рэляцыі ад іх у Рым, лісты ад манархаў і інш. асоб да рымскіх пап; матэрыялы справаводства Рэчы Паспалітай па рэліг. пытаннях. Матэрыялы выдання асвятляюць становішча каталіцкай царквы ў Польшчы і ВКЛ, увядзенне і ўмацаванне каталіцтва ў Літве, міжнар. адносіны ВКЛ, падрыхтоўку і правядзенне уніі паміж каталіцкай і правасл. цэрквамі, рэліг. барацьбу ў Рэчы Паспалітай у 16—18 ст., дзейнасць Радамскай, Барскай, Слуцкай, Тарунскай, Таргавіцкай і інш. канфедэрацый. Усяго надрукавана каля 3 тыс. дакументаў, у асн. на лацінскай, італьянскай і французскай мовах. Большасць крыніц надрукавана ўпершыню. Дакументы размешчаны ў храналагічным парадку. Змешчаны геаграфічна-імянныя паказальнікі, архіўныя шыфры, але археаграфічныя каментарыі адсутнічаюць.

СТА́РА-ЗАГО́РА, горад у цэнтр. Балгарыі, каля паўд. схілаў хрыбта Срэдна-Гара. Каля 180 тыс. ж. (2000). Вузел чыгунак і аўтадарог. Цэнтр с.-г. раёна (збожжа і жывёлагадоўля). Прам-сць: маш.-буд. (вытв-сць станкоў, прамысл. робатаў, абсталявання для харч. прам-сці, электронна-вылічальнай тэхнікі), тэкст., швейная, харч., тытунёвая, мэблевая. Паблізу буйны хім. камбінат; бальнеалагічны курорт Старазагорскі-Мінералні-Бані.

СТАРАКАСТЫ́ЛЬСКАЕ ПЛАСКАГО́Р'Е. У Іспаніі, у межах Кастыліі, паўн.-зах. ч. Месеты. Выш. да 800—1200 м (па ўскраінах да 1000—1200 м). Складзена з пясчанікаў, кангламератаў, вапнякоў і мергеляў. Расчлянёна на глыб. 100—120 м далінамі рэк бас. Дуэра. Ксерафітныя хмызняковыя зараснікі і стэпы, хваёвыя бары, дубровы. Вырошчваюць пшаніцу, кукурузу; вінаграднікі, сады. На С.п. гарады Вальядалід, Саламанка.

СТАРАМЯ́ДЗЕЛЬСКІ КЛЯ́ШТАР КАРМЕЛІ́ТАЎ БО́СЫХ. Засн. старостам зарэцкім Антоніем Кошчыцам 24.4.1754 у мяст. Стары Мядзел Мінскай вобл. Жылы корпус і касцёл Маці Божай з гары Кармель пабудаваны А.Кошыцам ў 1752—54 (асвячоны 15.8.1754). Касцёл — помнік архітэктуры барока, быў багата аздоблены скульптурай і размалёўкамі на тэмы Апошняга суда. Пад алтаром знаходзіліся мошчы св. Юстына, прывезеныя фундатарам з Рыма. Кляштар скасаваны ў 1840, у 1840—60 заняты пад правасл. жаночы манастыр. Касцёл у 1866 перароблены на правасл. царкву. У 1920 вернуты каталікам, пасля Вял. Айч. вайны зачынены. У 1990 адноўлена місія кармелітаў, касцёл рэстаўрыраваны. Гл. таксама *Мядзельскі Станіслававускі касцёл кармелітаў*.

А.А.Ярашэвіч.

СТАРАПАДДУ́БСКІ ВАЛУ́Н, геалагічны помнік прыроды рэсп. значэння (з 1994). Размешчаны на ПнЗ в. Старыя Паддубы Шчучынскага р-на Гродзенскай вобл. Буравата-жоўты граніт рапаківі з крышталямі палявога шпату (авоіды 2×8 см), парода кіроўнага тыпу. Даўж. 2,9 м, шыр. 1,9 м, выш. 1,3 м, у абводзе 8,2 м, аб'ём 3,8 м^3, маса каля 10 т. Прынесены ледавіком 20—18 тыс. г. назад з Аландскіх а-воў у Балт. моры.

В.Ф.Вінакураў.

СТАРАПЕ́СКАЎСКАЯ СЯДЗІ́БА, помнік сядзібна-паркавай архітэктуры класіцызму ў в. Старыя Пескі Бярозаўскага р-на Брэсцкай вобл. Сфарміравана ў канцы 18 — 1-й пал. 19 ст. ў маёнтку графаў Пуслоўскіх (належаў ім да 1939) на беразе воз. Чорнае. Першапачаткова арх.-кампазіцыйнае ядро комплексу складалі сядзібны дом, стайня, размешчаны паміж імі «павільён руж», 2 мураваныя брамы пры ўездзе ў вёску і сядзібу. Пасля зруйнавання ў 1843 мураванага сядзібнага дома (пабудаваны ў канцы 18 ст. ў стылі класіцызму) уладальнікі прыстасавалі пад жыллё драўляны будынак стайні. Прамавугольны ў плане 1-павярховы будынак з 4-калонным порцікам на гал. фасадзе, накрыты вальмавым дахам. Сцены атынкаваныя, вокны прамавугольныя з простымі ліштвамі. «Павільён руж» (не захаваўся) пабудаваны ў пач. 19 ст. з цэглы (па аналогіі з вядомай вілай-ратондай італьян. арх. А.Паладыо) — цэнтрычнае крыжова-купальнае 2-павярховае збудаванне, на яго гал. фасадзе масіўны 4-калонны порцік тасканскага ордэра з трохвугольным франтонам. Фрыз афармлены лепкай (атынкаваны ў 1863). Прасторавую кампазіцыю ўзбагачалі паўсферычны купал з ліхтаром і схілы сцен пры скрыжаванні аб'ёмаў. Фасады крапаваныя лапаткамі, паўцыркульнымі і прамавугольнымі нішамі, прафіляванымі карнізамі з сухарыкамі. Да будынка прымыкала вял. аранжарэя. Брамы выкананы ў рамант. формах сярэдневяковай готыкі. Паўночная брама — манум. збудаванне са стральчатым арачным праездам, фланкіраванае круглымі ў сячэнні 3-яруснымі вежамі і завершанае 2-ярусным зубчастым парапетам. Аздоблена стральчатымі нішамі, аркатурнымі і філянговымі паясамі, крыжамі, вузкімі шчылінамі-байніцамі, драўлянай імітацыяй зубчастай пад'ёмнай рашоткі. Па баках прыбудаваны нізкія каравулкі. Зах. брама (меншых памераў) вырашана ў стылі несапраўднай готыкі. Прамавугольная ў плане, з цэнтр. арачным праездам (замураваны) і 2 бакавымі каравулкамі. Вуглавыя ч. аб'ёмаў крапаваны лапаткамі са стральчатымі нішамі, завершаны зубчастым парапетам. Пейзажны парк разбіты на схіле да возера, вакол 2 сажалак і каналаў, праз якія былі перакінуты масткі. На востраве адной з сажалак была альтанка. Па-за межамі парку размешчаны цагляны бровар у познакласіцыстычным стылі. У парку раслі клён серабрысты, дубы чырвоны і летні пірамідальны, ясень пенсільванскі, хвоя веймутава, таполі белая і чорная пірамідальныя, лістоўніца еўрап., граб, вяз гладкі і інш. З зах. боку размяшчаецца пладовы сад, адмежаваны ад парку букавай алеяй. На паўд. ускраіне ў канцы алеі пагорак, дзе на могілках стаяла капліца (засталіся рэшткі). Дэкар. элементам парку быў драўляны вятрак — цэнтрычнае, круглае ў сячэнні збудаванне з купальным пакрыццём, узнятае на тэрасу-каланаду і выкананае ў адзіным стылі з асн. будынкамі. У 1990 распрацаваны праект аднаўлення парку (арх. Л.П.Луцэвіч). Іл. гл. да арт. *Рамантызм*.

А.М.Кулагін.

СТА́РА-ПЛАНІНА́, Балканскія горы. У Балгарыі, зах. адгор'і ў Югаславіі. Даўж. з З на У 555 км, выш. 2376 м (г. Боцеў). Складзена пераважна са сланцаў, гранітаў дакембрыю і палеазою, таксама з мезазойскіх вапнякоў, пясчанікаў, флішу. Вяршыні згладжаныя, паўн. пакатыя схілы пераходзяць у перадгор'і; паўд. схілы больш стромкія, прарэзаны далінамі рэк Іскыр, Луда-Камчыя. Радовішчы жал. руд, поліметалаў, кам. і бурага вугалю. Карст. С.-П. — важны кліматападзел паміж паўн. і паўд. Балгарыяй; у грабянёвай ч. выпадае 800—1100 мм ападкаў за год, горы некалькі месяцаў укрыты снегам. Да выш. 1700—1800 м шыракалістыя і хвойныя лясы, вышэй — лугі. Мінеральныя крыніцы, курорты. Перавал *Шыпка*; нац. парк Сцянета.

СТАРАРЭ́ЧЧА, тое, што *старыца*.

СТАРАСЕ́ЛЛЕ, палеалітычная стаянка ў пячоры каля г. Бахчысарай у Крыме (Украіна). Належыць мусцьерскай індустрыі (гл. *Мусцье*). Адкрыта і даследавана А.А.Фармозавым у 1952—56. Выяўлены каменныя рубільцы, апрацаваныя з 2 бакоў, востраканечнікі, скрэблы, лістападобныя наканечнікі і інш., рэшткі выкапнёвых жывёл; пахаванне дзіцяці (1,5—2 гадоў) з больш наяўнымі сапіентнымі рысамі ў параўнанні з неандэртальцам.

СТАРАСЕ́ЛЛЕ, возера ў Хойніцкім р-не Гомельскай вобл., на пойме р. Прыпяць, за 26 км на ПдЗ ад г. Хойнікі. Пл. 0,32 км^2, даўж. 3,2 км, найб. шыр. 130 м, даўж. берагавой лініі 7,8 км. Катлавіна старычнага тыпу, падзяляецца на 3 рукавы. Берагі выш. да 1 м, пад хмызняком, на З нізкія, забалочаныя.

СТАРАСЕ́ЛЛЕ, вёска ў Ігрушкаўскім с/с Крупскага р-на Мінскай вобл. Цэнтр калгаса. За 22 км на ПнЗ ад горада і 16 км ад чыг. ст. Крупкі, 131 км ад Мінска. 242 ж., 91 двор (2001). Базавая школа, б-ка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі.

СТАРАСЕ́ЛЛЕ, вёска ў Старасельскім с/с Шклоўскага р-на Магілёўскай вобл. Цэнтр калгаса. За 20 км на ПнЗ ад г. Шклоў, 50 км ад Магілёва, 12 км ад чыг. ст. Копысь. 478 ж., 192 двары (2002). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, амбулаторыя, аптэка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў. За 2 км на ПнУ ад вёскі магіла сав. ваеннапалонных і мірных жыхароў.

Вядома з 16 ст. як маёнтак у Аршан-

скім пав. Віцебскага ваяв. ВКЛ; уладанне Сапегаў. У 1606 у С. быў касцёл. З 1656 уладанне Нерушэвічаў, потым пратэстанцкай царквы. Вёска спалена ў час вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—67. З 1772 у Рас. імперыі, у Копыскай акрузе, у 19 ст. ў Аршанскім пав. Магілёўскай губ.; смалакурна-шкіпінарнае прадпрыемства (1859), Троіцкая царква і царк.-прыходская школа (1862). У 1868 уладанне Л.Цітова; 2 крупадзёрныя, вінакурны і цагельны з-ды, сукнавальня, 2 млыны, карчма. З 1886 мястэчка, цэнтр воласці Аршанскага пав.; 242 ж., 33 двары, валасное і мяшчанскае праўленне, 2 царквы, касцёл, сінагога, 2 кірмашы на год. У 1909 — 450 ж., 88 двароў. З 1919 у Гомельскай, з 1920 у Віцебскай губ., з 1924 у БССР. З 1924 цэнтр сельсавета Копыскага, з 1931 — Талачынскага, Шклоўскага р-наў, з 1938 у Магілёўскай вобл.

В.В.Віталёва.

СТАРАСЕ́ЛЬСКАЯ ШКЛЯНА́Я МАНУФАКТУ́РА. Дзейнічала ў 1880—1914 ва ўрочышчы Краснае каля в. Старое Сяло (Мінскі р-н). З 1890 наз. Красна-сельскі шкляны з-д. Вырабляла бутэлькі, шклянкі, лямпавае і лісцявое шкло. Мела шклоплавільную печ, конныя рухавікі. Працавала да 80 чал.

СТАРАСЕ́ЛЬСКІ ЛЕСАПІ́ЛЬНЫ ЗАВО́Д. Дзейнічаў у 1884—1914 у маёнтку Старое Сяло (цяпер вёска ў Мінскім р-не). Вырабляў дошкі і інш. піламатэрыялы. Меў паравую машыну. У 1884—89 працавала ад 16 да 135 чал.

СТАРАСЛАВЯНІ́ЗМ, тое, што *славяні́зм*.

СТАРАСЛАВЯ́НСКАЯ МО́ВА, самая старажытная літаратурна-пісьмовая мова *славян*. Належыць да паўд.-слав. падгрупы *славянскіх моў*. Зафіксавана ў помніках 10—11 ст., што працягвалі літ. традыцыю перакладзеных у 9 ст. з грэч. мовы асветнікамі *Кірылам і Мяфодзіем* і іх вучнямі хрысц. царк. кніг. У аснове С.м. — паўд.-македонскі (салунскі) дыялект стараж.-балг. мовы. Мае шмат агульнага з *праславянскай мовай*. С.м. зрабіла ўплыў на *рускую мову*, асабліва на яе сінтаксіс і лексіку. На *беларускую мову* ўплывала ў стараж. перыяд. Зберагліся спісы кірыла-мяфодзьеўскіх перакладаў 10—11 ст., напісаныя *глаголіцай* («Кіеўскія лісткі», Зографскае, Марыінскае і Асеманіева евангеллі, «Зборнік Клоца», «Сінайскі псалтыр», «Сінайскі трэбнік») і *кірыліцай* («Савіна кніга», Супрасльскі рукапіс, Астраміра ва евангелле, Енінскі апостал, Тураўскае евангелле і інш.).

Фанетыцы С.м. ўласцівы галосны «ě» (ѣ), насавыя галосныя «э» (ѧ), «е» (ѩ), «о» (ѫ), «ё» (ѭ), рэдукаваныя «ъ», «ь»; зычныя — складовыя «р» і «л», цвёрдыя «г», «к», «х» і мяккія «ж», «ч», «ц», «ј», «дз» (ѕ), «жд», «шт» (щ), няпоўнагалоссе, «ра», «ла» ў пачатку слова. Граматыцы С.м. ўласцівы адзіночны, парны і мн. л., 7 склонаў, у т.л. клічны, 6 скланенняў (у помніках 11 ст. намецілася іх перабудова ў скланенні па родах), дваякія формы асабовых і зваротнага займенніка ў давальным і вінавальным склонах, 4 формы прошлага часу дзеясловаў (аорыст, імперфект, перфект, плюсквамперфект), іменная форма дзеяслова супін для ўказання на мэту дзеяння, свабодны парадак слоў, назоўны склон іменнай часткі выказніка, канструкцыі з двайнымі склонамі ў ролі дапаўнення, непаўтарэнне адмоўя пры выказніку. У лексіцы С.м. шмат кніжна-абстрактных слоў грэч., менш лац. і ням. паходжання. З 11 ст. ў кожнага слав. народа С.м. пачала выступаць у мясц. рэдакцыях, якія прынята называць *царкоўнаславянскай мовай*.

Літ.: Ван-Вейк Н. История старославянского языка: Пер. с нем. М., 1957; Кривчик В.Ф., Можейко Н.С. Старославянский язык. Мн., 1970; Жуковская Л.П. Текстология и язык древнейших славянских памятников. М., 1976. *У.М.Свяжынскі.*

СТА́РАСТА СЕ́ЛЬСКІ, ніжэйшая службовая асоба сял. грамадскага кіравання ў Рас. імперыі, у т.л. на Беларусі. У адпаведнасці з рэформай дзярж. вёскі 1830—50-х г. пасада С.с. ўведзена ў паселішчах казённага сялянства еўрап. часткі краіны, а ў выніку *сялянскай рэформы 1861* — і ў паселішчах б. панскіх сялян. Выбіраўся сельскім сходам на 3 гады. Выступаў адначасова як кіраўнік сельскай грамады і як ніжэйшая службовая асоба дзярж. кіравання. Ён склікаў па меры патрэбы сельскі сход і выконваў яго пастановы, назіраў за спраўнасцю дарог і мастоў, за захаваннем збожжа ў хлебазапасных магазінах і інш. На яго ўскладаліся таксама фіскальныя абавязкі і адм. паліцэйскія функцыі, меў права караць сялян. Непасрэдна падпарадкоўваўся валасному старшыні, выконваў распараджэнні паліцыі, *міравога пасрэдніка*, земскага ўчастковага начальніка і «ўсіх прызначаных улад па прадметах іх ведамства». Старасты меліся ў дзярж. маёнтках і да 19 ст., а ў панскіх уладаннях і да 1861, але назначаліся адпаведна ўладамі і памешчыкамі, поўнасцю падпарадкоўваліся ім.

В.П.Панюціч.

СТАРАСЦЕ́НЬ (Senecio), род кветкавых раслін сям. складанакветных. Каля 3 тыс. (паводле інш. звестак да 2 тыс.) відаў. Пашыраны ўсюды. Многія віды *сукуленты*, часта вырошчваюцца ў аранжарэях і пакоях. На Беларусі 15 відаў, з іх у Чырв. кнігу занесены 5: водны (S. aquaticus), дняпроўскі (S. borysthenicus), прыручайны (S. rivularis), прырэчны (S. fluviatilis), эрукалісты (S. erucifolius). Трапляюцца па схілах, на поймавых лугах, у хмызняках.

Адна-, двух- і шматгадовыя травяністыя расліны, ліяны, радзей кусты, паўкусцікі, невысокія дрэвы (напр., разеткавыя дрэвы афрыканскіх тропікаў выш. да 7 м). Сцёблы голыя або апушаныя. Лісце чаргаванае, простае, суцэльнае ці перыстарассечанае, сцябловае сядзячае, прыкаранёвае на чаранках. Кветкі ў адзіночных кошыках або сабраныя ў гронка-, шчыткападобнае ці мяцёлчатае суквецце, жоўтыя, аранжавыя, чырв., пурпурныя, фіялетавыя. Плод — сямянка. Лек., фарбавальныя, меданосныя, дэкар. расліны, некат. пустазелле.

А.М.Скуратовіч.

СТА́РАСЦЬ, перыяд жыцця чалавека і жывёл, які прыходзіць на змену сталасці; вынік працэсу *старэння*. Характарызуецца значнымі абменнымі, структурнымі і функцыян. зменамі ў органах і сістэмах, што абмяжоўваюць прыстаса-



1 2 3 4

Старасцень: 1 — дняпроўскі; 2 — прырэчны; 3 — веснавы; 4 — звычайны.

вальныя магчымасці арганізма. Мяняецца знешні выгляд, працаздольнасць, цячэнне многіх захворванняў. Перыяд С. ў чалавека 75—90 гадоў, больш за 90 — доўгажыхар. *А.С.Леанцюк.*

СТАРАФІ́НЫ (Suometarelajset), назва ў 1889—1918 членаў Фінскай партыі (т.зв. фенаманы), апанентаў *младафінаў*. Выражалі пераважна інтарэсы фінл. прадпрымальнікаў, землеўладальнікаў і інтэлігенцыі; выступалі супраць русіфікацыі Фінляндыі. Лідэры — І.Ір'ё-Коскінен, Ю.Даніельсан-Кальмары, Ю.К.*Пасіківі*. У пач. 20 ст. ва ўмовах уціску рус. улад прытрымліваліся пазіцыі лаяльнасці і кампрамісу (стратэгія перагавораў) у адносінах да Расіі. У 1907 мелі 59, у 1917 — 32 месцы ў сейме. У 1918, калі Фінляндыя стала незалежнай ад Расіі, выступалі за моцную манархічную ўладу і знешнепаліт. арыентацыю на Германію; на аснове С. утварылася манархічна настроеная Нац. кааліцыйная партыя.

СТА́РАЦ, выбарная асоба валаснога самакіравання на тэр. Беларусі да 2-й пал. 16 ст. Існавалі С. ўсёй воласці — пасрэднікі паміж яе насельніцтвам і феадалам-уласнікам або яго прадстаўніком і С. асобных вёсак. С. разам з абшчынай размяркоўвалі павіннасці на канкрэтных выканаўцаў і сачылі за іх выкананнем, збіралі *даніну* і адвозілі яе гаспадару ўладання, падтрымлівалі парадак, сачылі за станам дарог, мастоў і інш. Выбіраліся на агульных сходах вёскі, воласці і за выкананне сваіх абавязкаў вызваляліся ад павіннасцей, акрамя мядовай даніны. Удзельнічалі ў *копных судах*, вырашалі межавыя і бортныя спрэчкі паміж сялянамі. У выніку змен сістэмы гаспадарання ў 16 — пач. 17 ст. С. замяняліся *войтамі*. На ўсх. Беларусі пасада С. захавалася на больш працяглы час. *А.Б.Доўнар.*

СТАРАЧЭ́ХІ [Staročeši; афіц. назва — Чэшская нацыянальная партыя, Česká národní strana (staročeská)], буржуазна-кансерватыўная партыя ў Чэхіі ў 1860—1918. Назву атрымала пасля вылучэння з яе складу ў 1874 *младачэхаў*. Ідэолагі і лідэры С. — Ф.*Палацкі*, Ф.Л.Рыгер, К.Матуш і інш. С. выступалі за захаванне Габсбургскай манархіі, за ажыццяўленне т.зв. чэш. дзярж. права (аўтаномія зямель чэш. кароны ў межах імперыі Габсбургаў), супраць бурж.-дэмакр. пераўтварэнняў. Да 1879 праводзілі палітыку пасіўнай абструкцыі аўстр. рэйхсрата, потым увайшлі ў яго склад, дзе займалі крайне правыя пазіцыі. Пасля паражэння на выбарах 1891 страцілі паліт. ўплыў. У 1918 увайшлі ў партыю Чэш. дзярж.-прававой дэмакратыі (у 1919—34 Нац.-дэмакр. партыя).

СТАРА́Я БЕ́ЛІЦА, вёска ў Гомельскім р-не, на аўтадарозе Гомель—Уваравічы. Цэнтр сельсавета. За 20 км на ПнЗ ад Гомеля, 12 км ад чыг. ст. Уза. 567 ж., 333 двары (2001). Базавая школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Помнікі ахітэктуры: *Старабеліцкая Мікалаеўская царква*, сядзіба (канец 18 — 2-я пал. 19 ст.).

У 18 ст. вёска ў Гомельскім старостве Рэчы Паспалітай, уладанне Чартарыйскіх. З 1772 у Рас. імперыі. У 1773 — 490 ж., 47 двароў. У 1775 С.Б. падаравана імператрыцай Кацярынай II кн. М.Кантгаўзену. У 1777—86 у сувязі з буд-вам новага цэнтра Беліцкага пав. (Новай Беліцы) павятовая адміністрацыя размясцілася ў С.Б. У 1875 сяло, 666 ж., 150 двароў, нар. вучылішча, царква. З 1878 да 1914 прыватнае ўладанне Солтан-Перасветаў. У 1886 — 664 ж., 110 двароў, вінакурны з-д, 2 ветраныя млыны, царква. З 8.12.1926 цэнтр сельсавета Уваравіцкага р-на Гомельскай акругі, 635 ж., 194 двары. З 20.2.1938 у Гомельскай вобл., з 17.4.1962 у Гомельскім р-не. У Вял. Айч. вайну ням. фашысты загубілі тут 12 жыхароў.

СТАРА́Я БЕ́ЛІЦА, вёска ў Сенненскім р-не Віцебскай вобл., каля аўтадарогі Орша—Лепель; чыг. ст. Бурбін на лініі Орша—Лепель. Цэнтр Беліцкага с/с. За 15 км на Пд ад г. Сянно, 71 км ад Віцебска. 250 ж., 127 двароў (2001). Сярэдняя школа, б-ка. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан. Помнік архітэктуры — сядзіба (2-я пал. 19 ст.).

СТАРА́Я БУ́ДА, вёска ў Буда-Кашалёўскім р-не Гомельскай вобл., каля аўтадарогі Гомель—Жлобін. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 22 км на ПдЗ ад горада і чыг. ст. Буда-Кашалёва, 45 км ад Гомеля. 660 ж., 282 двары (2001). Базавая школа, дамы культуры і нар. медыцыны, б-ка, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

СТАРА́Я ВАДВА́, вёска ў Каменналаўскім с/с Шклоўскага р-на Магілёўскай вобл., на р. Лахва. Цэнтр калгаса. За 22 км на ПдЗ ад г. Шклоў, 27 км ад Магілёва, 7 км ад чыг. ст. Лотва. 323 ж., 146 двароў (2001). Базавая школа, клуб, б-ка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

СТАРА́Я ГАЛЫ́НКА, вёска ў Зэльвенскім р-не Гродзенскай вобл., на аўтадарозе Дзярэчын—Слонім. Цэнтр Галынкаўскага с/с і калгаса. За 18 км на ПнУ ад гар. пас. і 20 км ад чыг. ст. Зэльва, 110 км ад Гродна. 292 ж., 112 двароў (2001). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, амбулаторыя, аптэка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Магіла ахвяр фашызму. Помнік архітэктуры — вадзяны млын (канец 19 ст.).

Вядома з 16 ст. як вёска Галынка ў Лідскім пав., прыватная ўласнасць. Пасля 3-га падзелу Рэчы Паспалітай (1795) у Рас. імперыі. У 19 ст. мястэчка ў Слонімскім пав. Гродзенскай губ., дзярж. ўласнасць. У 1878 у С.Г. 293 ж.; у 1886 — 275 ж., 45 двароў, школа, царква, 3 сінагогі, крупадзёрка, 2 карчмы; у 1903 — 691 ж. З 1921 ў складзе Польшчы, у Старавескай гміне Слонімскага пав. Навагрудскага ваяв., 432 ж., 84 двары. З 1939 у БССР, з 15.1.1940 у Зэльвенскім р-не Баранавіцкай вобл. З 12.10.1940 вёска, цэнтр сельсавета. У Вял. Айч. вайну ням. фашысты загубілі ў С.Г. 386 ж. З 20.9.1944 ў Гродзенскай вобл. У 1962—66 у Слонімскім р-не.

СТАРА́Я КА́МЕНКА, вёска ў Слаўгарадскім р-не Магілёўскай вобл., каля р. Сож. Цэнтр Каменкаўскага с/с. За 15 км на Пд ад г. Слаўгарад, 83 км ад Магілёва, 76 км ад чыг. ст. Крычаў. 173 ж., 61 двор (2001). Базавая школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Каля вёскі стаянкі эпох мезаліту, неаліту і бронзавага веку.

«СТАРА́Я ПРЫ́СКАЗКА», бел. перакладны твор 19 ст., ранейшы варыянт *«Дзядзькі Антона»*. Выдадзены К.Гучкоўскім у Львове (канфіскаваны паліцыяй).

СТАРА́Я РУ́ДЗІЦА, гарадзішча *штрыхаванай керамікі культуры* каля в. Старая Рудзіца Дзяржынскага р-на Мінскай вобл. Даследаваў у 1952 А.Р.Мітрафанаў. Пляцоўка (памер 52 × 48 м) умацавана валамі і ровам паміж імі. Выяўлены рэшткі доўгага шматкамернага жытла слупавой канструкцыі з агнішчам. Знойдзены фрагменты ляпнога посуду, пласціністага ўпрыгожання, гліняныя прасліцы, бронзавыя драцяное кольца, спіралькі.

СТАРА́Я РУ́ДНЯ, вёска ў Жлобінскім р-не Гомельскай вобл., на р. Окра; чыг. ст. на лініі Гомель—Жлобін. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 22 км на ПдУ ад г. Жлобін, 80 км ад Гомеля. 970 ж., 415 двароў (2001). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў, помнік Л.Р.*Пятроўскаму*.

СТАРА́Я РУ́СА, горад у Наўгародскай вобл. Расіі. Вядомы з 11 ст. Каля 50 тыс. ж. (2001). Прыстань на р. Палісць (бас. воз. Ільмень), чыг. ст., вузел аўтадарог. Прам-сць: маш.-буд., лёгкая, харч., буд. матэрыялаў, паліграфічная. Краязнаўчы музей. Мемарыяльны музей Ф.М.Дастаеўскага. Бальнеагразевы курорт. Засн. ў 1828. Клімат умерана кантынентальны. Асн. прыродныя лек. фактары — хларыдныя натрыевыя мінер. воды з утрыманнем брому (да 50 мг/л), кальцыю, магнію (на пітное лячэнне і ванны) і сульфідныя глеевыя гразі салёных азёр, якія ўтрымліваюць серавадарод і жалеза. Лечаць захворванні органаў руху і апоры, страўніка і кішэчніка, печані, нерв. сістэмы, гінекалагічныя. Санаторый з аддзяленнем для падлеткаў, бальнеагразелячэбніца, пітная галерэя.

СТАРЖЫ́НСКАЯ Наталля Сцяпанаўна (н. 20.1.1948, г. Агдам, Азербайджан), бел. вучоны ў галіне педагогікі і лінгвістыкі. Д-р пед. н. (1998), праф. (2000). Скончыла Мінскі пед. ін-т (1971). З 1971 у НДІ педагогікі Мін-ва асветы Беларусі (з 1979 заг. аддзела). З 1989 у Бел. пед. ун-це (у 1998—2001 заг. кафедры). Навук. працы па методыцы навучання дашкольнікаў пісьменнасці, роднай і замежнай мовам, праблемах падрыхтоўкі дзяцей да школы, станаўлення і развіцця іх мовы.

Тв.: Становление речи у дошкольников //

Детская психология. Мн., 1988; Уводзіны ў методыку развіцця маўлення. Мн., 1994; Методыка развіцця роднага маўлення. Мн., 1998; Обучение грамоте в детском саду. Мн., 2000; Тэорыя і методыка развіцця беларускага маўлення дашкольнікаў. Мн., 2000.

СТАРЖЫ́НСКІ Валерый Паўлавіч (н. 16.10.1950, в. Замошша Слуцкага р-на Мінскай вобл.), бел. філосаф. Д-р філас. н. (1993), праф. (1997). Скончыў Мінскі пед. ін-т (1971). З 1972 у Бел. політэхн. акадэміі. Навук. працы па філас. аспектах фізіка-матэм. навук, праблемах метадалогіі тэхніказнаўства, гуманізацыі адукацыі. Распрацаваў тэорыю праектавання вышэйшай інж.-тэхн. адукацыі.

Тв.: Гуманизация инженерного образования и конструктивная методология // Стереотипы и динамика мышления. Мн., 1993; Гуманизация образования в Республике Беларусь: состояние и перспективы (разам з В.І.Ярмак) // Адукацыя і выхаванне. 1996. №3—5; Гуманизация инженерного образования: Филос.-конструктивный подход. Мн., 1997; Методология в сфере науки и проектирования // Изв. Междунар. академии технич. образования. 2000. №1.

СТАРЖЫ́НСКІ Віктар Яўгенавіч (н. 17.12.1933, г. Барысаў Мінскай вобл.), бел. вучоны ў галіне машынабудавання. Д-р тэхн. н. (1988). Скончыў Бел. ін-т інжынераў чыг. транспарту (1958). З 1966 у Ін-це механікі металапалімерных сістэм Нац. АН Беларусі (з 1971 заг. лабараторыі, з 1989 заг. аддзела). Навук. працы па метадах разліку, праектавання і тэхналогіі вырабу дэталей машын з палімерных кампазіцыйных матэрыялаў, аптымізацыі кінематычных схем прыводаў прыбораў. Распрацаваў метады разліку геам. параметраў і паказчыкаў дакладнасці пластмасавых зубчастых колаў і формаўтваральнага інструменту для іх вырабу. Дзярж. прэмія Беларусі 1972.

Тв.: Металлополимерные материалы и изделия. М., 1979 (у сааўт.); Прикладная механика слоистых тел из композитов: Плоские контактные задачи. Мн., 1988 (разам з В.В.Мажароўскім); Пластмассовые зубчатые колеса в механизмах приборов: Расчет и конструирование. Гомель, 1998 (у сааўт.).

СТАРК Э́РЛІСТ, раннялетні сорт яблыні. Пашыраны на Беларусі.

Дрэвы маларослыя, з круглаватай кронай. Плады выспяваюць у 1-й дэкадзе жніўня, сярэдняй велічыні (80—90 г), плясната-круглаватай формы, жаўтавата-белаватыя з яркачырв. румянцам і ружовымі крапінкамі. Мякаць белая, сакаўная, шчыльная, кіславата-салодкага смаку з прыемным пахам. Сорт хуткаплодны, плоданашэнне пачынае на 3-і год. Ураджайнасць сярэдняя. Адносна ўстойлівы да паршы. Зімаўстойлівасць сярэдняя.

СТА́РЛІНГ (Starling) Эрнест Генры (17.4.1866, Лондан — 2.5.1927), англійскі вучоны ў галіне фізіялогіі. Скончыў Лонданскі ун-т (1886). У 1899—1923 праф. гэтага ун-та. Працаваў у Брэславе, Парыжы. Навук. працы па кровазвароце, лімфаўтварэнні, інервацыі і матарыцы кішэчніка, функцыі нырак, сакрэцыі падстраўнікавай залозы. У 1902 разам з англ. фізіёлагам У.Бейлісам адкрыў гармон сакрацін і ўвёў у навуку тэрмін «гармон» (1905).

Тв.: Рус. пер.,— Основы физиологии человека. Т. 1—2. М.; Л., 1931—33.

СТАРЛЫ́ГІ, вёска ў Сырмежскім с/с Мядзельскага р-на Мінскай вобл. Цэнтр калгаса. За 42 км на ПдЗ ад г. Мядзел, 150 км ад Мінска, 76 км ад чыг. ст. Княгінін. 290 ж., 90 двароў (2001). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, амбулаторыя, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

СТАРО́БІН, гарадскі пасёлак у Салігорскім р-не Мінскай вобл., на р. Случ. Аўтадарогамі злучаны з Салігорскам, Любанню, Мікашэвічамі. За 12 км на Пд ад горада і чыг. ст. Салігорск, за 145 км ад Мінска. 6 тыс. ж. (2001).

Вядомы з 16 ст. як слабада Слуцкага княства ВКЛ. Уласнасць Алелькавічаў, Радзівілаў, Вітгенштэйнаў, Гогенлое. У 1654 атрымаў права на штогадовыя таргі і 4 кірмашы. У 1680 мястэчка Навагрудскага ваяв. З 1791 цэнтр воласці Случарэцкага пав. З 1793 у Рас. імперыі ў Слуцкім пав. Мінскай губ. У 1886 — 496 ж., 62 двары, школа, 3 яўр. школы, 2 царквы, піваварня, 2 крамы. У 1924—62 цэнтр *Старобінскага раёна*. З 27.9.1938 гар. пасёлак. 26.6.1941 акупіраваны нямецкімі фашыстамі, якія ў С. і раёне знішчылі 2886 чал.; 29.6.1944 партызаны 101-й брыгады імя Аляксандра Неўскага занялі гар. пасёлак (гл. *Старобінскі бой 1944*) і ўтрымлівалі да падыходу 2 ліп. часцей 1-га Бел. фронту. З 1962 у Любанскім, з 1965 у Салігорскім р-нах.

Працуюць *Старобінскі торфабрыкетны завод*, дрэваапр. камбінат, лясгас; гімназія, рэгіянальны цэнтр прафес. адукацыі, муз. школа, дашкольная ўстанова, Дом культуры, 2 б-кі, бальніца, паліклініка, аптэка, аддз. сувязі. Магілы ахвяр фашызму, магіла Героя Сав. Саюза Дз.Ц.*Гуляева*. Помнік землякам, што загінулі ў Вял. Айч. вайну. Мемар. комплекс сав. воінам, партызанам і землякам.

З.В.Рамановіч.

СТАРО́БІНЕЦ Рыгор Лазаравіч (14.5.1910, г. Беразіно Мінскай вобл. — 10.11.2001), бел. хімік. Чл.-кар. Нац. АН Беларусі



Р.Л.**Старобінец**.

(1969), д-р хім. н. (1955), праф. (1956). Засл. дз. нав. Беларусі (1980). Скончыў БДУ (1936), дзе і працаваў з 1940 (у 1956—89 заг. кафедры), у 1989—2000 у НДІ фіз.-хім. праблем пры БДУ. Навук. працы па фіз., аналіт. і калоіднай хіміі. Даследаваў заканамернасці сорбцыі і абмену іонаў у водна-арган. асяроддзях, заканамернасці экстракцыі арган. рэчываў у водна-арган. сістэмах. Распрацаваў варыянты метаду інкрэментаў для вызначэння найлепшых умоў экстракцыйнага вылучэння арган. іонаў рознай будовы, тэарэт. асновы стварэння селектыўных мембранных электродаў для колькаснага аналізу розных рэчываў.

Тв.: Каучукоподобные полимеры — сорбенты и хроматографические материалы. Мн., 1959 (разам з У.С.Камаровым); Изучение необменной сорбции α-аминокислот сильноосновным анионитом на основе метода инкрементов групп (разам з Т.І.Баршчанскай, С.Р.Максімавай) // Докл. АН БССР. 1983. Т. 27, №2.

СТАРО́БІНСКАЕ РАДО́ВІШЧА КАЛІ́ЙНЫХ І КАМЕ́ННАЙ СО́ЛЕЙ, адно з найбуйнейшых у свеце, у Салігорскім р-не Мінскай вобл. Адкрыта ў 1949, распрацоўваецца з 1963. Прымеркавана да паўн.-зах. краявой ч. *Прыпяцкага саляноснага басейна*. Паклады звязаны з верхнедэвонскай саляноснай фармацыяй. Сістэмай разломаў плошча радовішча падзелена на 3 тэктанічныя блокі: Заходні, Цэнтральны (1-, 2-, 3-е шахтавыя палі) і Усходні (4-е шахтавае поле). Па ўнутрысалявых гарызонтах радовішча ўяўляе сабой асіметрычную прыразломную сінкліналь субшыротнага распасцірання. Саляносная тоўшча (магутнасць 50—800 м і больш) складзена з пачкаў карбанатна-гліністых парод (4—40 м) і каменнай солі (3—45 м). Развіты 4 калійныя гарызонты (I, II, III, IV), распрацоўваюцца II і III. II гарызонт (глыб. залягання 368—700 м, магутнасць 1,4—2,9 м) уключае 2 сільвінітавыя слаі і прамежкавы слой каменнай солі. III гарызонт (глыб. залягання 350—1100 м, магутнасць 2—28 м) складзены з 2 сільвінітавых (ніжні распрацоўваецца) і сярэдняга глініста-карналітавага пластоў. Калійныя солі бессульфатнага тыпу прадстаўлены мікра-, дробна- і сярэднезярністымі сільвінітамі. Маюць 23—29% хлорыстага калію, 0,1—0,2% хлорыстага магнію, 3,9—5,6% нерастваральных рэшткаў. Агульныя балансавыя запасы калійных солей па катэгорыях $A+B+C_1$ — 2,65 млрд. т, па катэгорыі C_1 — 0,57 млрд. т. Балансавыя запасы каменнай солі па катэгорыях $A+B+C_1$ — 0,77 млрд. т. Штогод здабываецца каля 25 млн. т калійных і 0,5 млн. т каменнай солей. Вытв-сць калійных угнаенняў у 2000 3,4 млн. т (у пераліку на 100% аксіду калію). Радовішча з'яўляецца сыравіннай базай ВА «Беларуськалій». Распрацоўка радовішча выклікала шэраг экалагічных праблем, звязаных з негатыўным уздзеяннем калійнай вытв-сці на навакольнае асяроддзе: асяданне зямной паверхні над горнымі вырабаткамі, падтапленне, забалочванне і затапленне зямель, засаленне глебы і падземных вод, намнажэнне цвёрдых галітавых і вадкіх глініста-салявых адкладаў калійнай вытв-сці.

Э.А.Высоцкі.

СТАРО́БІНСКІ БОЙ 1944, бой партызан 101-й брыгады імя Аляксандра Неўскага (камандзір М.Дз.Курыльчык) па вызваленні г.п. *Старобін* ад фаш. захопнікаў 29 чэрв. ў Вял. Айч. вайну. Старобінскі гарнізон (больш за 1 тыс. гітлераўцаў) быў моцна ўзброены, умацаваны дзотамі, акопамі, драцянымі загародамі. З набліжэннем Чырв. Арміі гітлераўцы мелі намер вывезці насельніцтва і матэрыяльныя каштоўнасці на З, а пасёлак знішчыць. Партызаны ў ноч на 29 чэрв. перакрылі шляхі магчымага падыходу варожага падмацавання з г. Любань і в. Пагост, кулямётным агнём у бок гарнізона стварылі там панiку. Адначасовай атакай з ПнУ і Пд партызаны выбілі праціўніка са Старобіна на ПдЗ ад яго, арганізавалі абарону і ўтрымлівалі пасёлак да падыходу 1—2 ліп. часцей Чырв. Арміі. Дзякуючы дзеянням нар. мсціўцаў удалося выратаваць Старобін ад знішчэння і насельніцтва ад вывазу ў Германію.

СТАРО́БІНСКІ РАЁН, адм.-тэр. адзінка ў Беларусі ў 1924—62. Утвораны 17.7.1924 у Слуцкай акр. Цэнтр — г.п. *Старобін*. 20.8.1924 падзелены на 15 сельсаветаў. З 9.6.1927 да 26.7.1930 у Бабруйскай, з 21.6.1935 у Слуцкай акр., з 20.2.1938 у Мінскай, з 20.9.1944 у Бабруйскай, з 9.1.1954 у Мінскай абл. 25.12.1962 раён скасаваны, яго тэр. далучана да Любанскага р-на.

СТАРО́БІНСКІ ТОРФАБРЫКЕ́ТНЫ ЗАВО́Д. Будаўніцтва пачата ў 1972 у г.п. *Старобін*. Прадукцыю выдае з 1977. Магутнасць з-да складала 160 тыс. т брыкету за год. У 2001 магутнасць з-да 130 тыс. т брыкету, здабыча торфу — 240 тыс. т. Мае цэхі: брыкетны, чыгуначны, рамонтна-мех., аўтатрансп., кацельную, 2 участкі па здабычы торфу. Асн. прадукцыя (2002): тарфяны брыкет, рамонт торфаздабыўной тэхнікі.

СТАРО́Е ВО́ЗЕРА. У Чачэрскім р-не Гомельскай вобл., у бас. р. Сож, за 9 км на Пд ад г. Чачэрск. Пл. 0,63 км^2, даўж. 1,1 км, найб. шыр. 800 м, найб. глыб. 4 м, даўж. берагавой лініі больш за 3 км. Пл. вадазбору 18,8 км^2. Схілы катлавіны выш. 14—15 м (на ПнУ і ПдЗ да 3 м), разараныя. Берагі выш. да 1 м, пад хмызняком. На ПнУ і ПдЗ пойма, парэзаная сеткай меліярац. каналаў. Дно выслана сапрапелем, каля берагоў пясчанае. На З сцёк па меліярац. канале ў воз. Асіннае.

СТАРО́Е ВЫСО́КАЕ, вёска ў Ельскім р-не Гомельскай вобл., на аўтадарозе Ельск—Буйнавічы. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 26 км на З ад горада і чыг. ст. Ельск, 203 км ад Гомеля. 427 ж., 161 двор (2001). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

СТАРО́Е ЛЯ́ДНА, вёска ў Лепельскім с/с Лепельскага р-на Віцебскай вобл., каля воз. Лядна, на аўтадарозе Лепель—Віцебск. Цэнтр калгаса. За 10 км на Пн ад горада і чыг. ст. Лепель, 105 км ад Віцебска. 348 ж., 129 двароў (2001). Мукамольна-крупяное прадпрыемства. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

СТАРО́Е ПРЫБУ́ЖЖА, вёска ў Міхееўскім с/с Дрыбінскага р-на Магілёўскай вобл., на р. Проня, каля аўтадарогі Магілёў—Дрыбін. Цэнтр калгаса. За 4 км на ПдЗ ад г.п. Дрыбін, 65 км ад Магілёва, 14 км ад чыг. ст. Цёмны Лес. 242 ж., 100 двароў (2001). Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

СТАРО́Е СЯЛО́, гарадзішча, селішча і 3 курганныя могільнікі каля в. Старое Сяло Віцебскага р-на. Даследавалі А.М.Ляўданскі, С.А.Дубінскі, Г.В.Штыхаў. Гарадзішча *днепра-дзвінскай культуры* (3—4 ст. н.э.) памерам 30 × 70 м, з боку поля ўмацавана валам. Знойдзены ляпны гладкасценны і штрыхаваны посуд, фрагмент жал. прылады і інш. На селішчы (датуецца 6—8 ст.) знойдзена ляпная кераміка. Курганны могільнік-1 належаў *крывічам* (14 круглых насыпаў дыям. 8—10 м, выш. 1,5 м і 2 доўгія курганы памерам 20—25 × 8—10 м, выш. 2,5 м; датуецца 8—10 ст.). Пахавальны абрад — трупаспаленне. Знойдзены ляпны і ганчарны посуд. Курганныя могільнікі -2 і -3 не даследаваны.

СТАРО́Е СЯЛО́, вёска ў Хальчанскім с/с Веткаўскага р-на Гомельскай вобл., каля р. Сож. Цэнтр Рэсп. с.-г. унітарнага прадпрыемства па племянной справе «Гомельскі конны з-д № 59». За 12 км на ПдЗ ад г. Ветка, 14 км ад Гомеля. 861 ж., 388 двароў (2001). Філіял Веткаўскага цагельнага з-да. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

СТАРО́Е СЯЛО́, вёска ў Лятчанскім с/с Віцебскага р-на, на аўтадарозе Віцебск—Полацк; чыг. ст. на лініі Віцебск—Полацк. Цэнтр камунальнага унітарнага с.-г. прадпрыемства. За 24 км на З ад Віцебска. 534 ж., 224 двары (2001). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, бальніца, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Каля вёскі археал. помнік *Старое Сяло*.

У пач. 16 ст. вядома як баярская ўласнасць, у Віцебскім ваяв. ВКЛ. У 1523 баярыня А.Мастычына і яе сын Ю.Сянкевіч прадалі С.С. віцебскаму ваяводу і каралеўскаму маршалку І.Б.Сапегу. З 18 ст. родавы маёнтак Лускінаў, у склад якога ўваходзілі таксама в. Плетніца і Запруддзе, у 1846 у С.С. вадзяны млын, крупадзёрка, кузня, карчма, штогод адбываліся кірмашы, з 1865 нар. вучылішча; з 1886 валасное праўленне, паштовая станцыя, школа. З 20.8.1924 вёска, цэнтр сельсавета *Лосвідскага раёна*, з 29.10.1924 у *Кузняцоўскім раёне*, з 26.3.1927 у *Віцебскім раёне*. У 1941 — 481 ж., 125 двароў. У Вял. Айч. вайну ў чэрв. 1944 гітлераўцы знішчылі 18 жыхароў і спалілі вёску. З 22.12.1960 у Лятчанскім с/с. У 1969 у С.С. 611 ж., 245 двароў. *В.В.Віталеёва.*

СТАРО́Е СЯЛО́, вёска ў Рагачоўскім р-не Гомельскай вобл., на правым беразе р. Дабрыца. Цэнтр сельсавета і птушкафабрыкі «Рагачоўская». За 10 км на Пн ад г. Рагачоў, 131 км ад Гомеля, 2 км ад чыг. раз'езда Старасельскі. 530 ж., 198 двароў (2001). Лясніцтва. Сярэдняя школа, б-ка, аддз. сувязі. Брацкія магілы сав. воінаў і партызан.

СТАРО́СТА, с т а р а с т а, 1) у Старажытнай Русі прадстаўнік ніжэйшай княжацкай адміністрацыі, звычайна з халопаў. У «Рускай праўдзе» ўпамінаюцца С. сельскі і ратайны. 2) У ВКЛ у 16—18 ст. С.— службовая асоба, якая кіравала адм. акругай (паветам), намеснік вял. князя (караля). Першапачаткова ажыццяўляў у акрузе поўную дзярж. і суд. ўладу. З узмацненнем у 16 ст. шляхецкага самакіравання і судаводства ў кампетэнцыі С. застаўся толькі *гродскі суд* (замкавы). Прызначаў сабе намесніка — *падстароосту*. На сойме 1774 пастаноўлена, каб гродавыя С. выбіраліся ў паветах. Чатырохгадовы сойм 1788—92 скасаваў суд. С. 3) У ВКЛ у 16—18 ст. С. н я г р о д а в ы — дзяржаўца каралеўскіх маёнткаў (*старостваў*), звычайна пажыццёвы. Не меў адм.-судовых функцый, карыстаўся даходамі з маёнтка, у дзярж. скарб выплачваў кварту (чвэрць) на ўтрыманне войска. Атрымліваў староства ад манарха і сойма як узнагароду «за публічныя заслугі». 4) У Рас. імперыі службовая асоба сял. грамадскага кіравання. Гл. *Стараста сельскі*. 5) У 1918—39 кіраўнік павятовай адміністрацыі ў Польшчы, з 1921 і ў Зах. Беларусі.

СТАРО́СТВА, с т а р а с т в а, дзяржаўны маёнтак у ВКЛ (16—18 ст.) і Польшчы (14—18 ст.), які даваў вял. князь або кароль на часовае карыстанне феадалам за службу. Г р о д а в ы я С. прыпісваліся да судова-адм. цэнтраў — замкаў і складалі кармленне дзярж. службовых асоб — *старостаў*. Н я г р о д а в ы я С. даваліся на пажыццёвае карыстанне як узнагарода за паслугі вял. князю ці дзяржаве, а таксама здаваліся ў арэнду за пэўную гадавую плату ці ў залог за грашовую пазыку. З 1562 уладальнікі С. ўносілі ў дзярж. скарб на ўтрыманне войска т. зв. кварту — $^1/_4$ частку чыстага даходу. З 1775 кварта падвоена. Перыядычна праводзіліся рэвізіі (люстрацыі) С. Феадалы імкнуліся як мага даўжэй пратрымаць С. ў сваім родзе, пераўступалі яго (са згоды вял. князя) пры жыцці членам сваёй сям'і ці пабочным асобам за плату. Вял. князі выкарыстоўвалі права раздачы С. з мэтай вярбоўкі сваіх прыхільнікаў. Шляхта вяла барацьбу за абмежаванне гэтага права. У 1775 сойм забараніў раздачу С., і яны павінны былі пасля смерці ўладальніка здавацца ў спадчынную арэнду на 50 гадоў. Да 1791 удзельная вага С. сярод зямельных

уладанняў на Беларусі (без усх. часткі) складала 8%. Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай С. ўвайшлі ў склад дзярж. маёнткаў. Пазней некаторыя з іх, асабліва ва ўсх. Беларусі, падараваны рас. дваранам. *П.Р.Казлоўскі.*

СТАРО́Ў Іван Ягоравіч (23.2.1745, С.-Пецярбург — 17.4.1808), рускі архітэктар; адзін з заснавальнікаў рус. *класіцызму*. Акад. Пецярбургскай АМ (з 1769). Вучыўся ў Пецярбургскай АМ (1758—62), выкладаў у ёй (1769—72, з 1785 праф.). Як пенсіянер АМ у 1762—68 працаваў у Парыжы і Рыме. У 1772—74 гал. архітэктар Камісіі па мураванай будоўлі Пецярбурга і Масквы. Аўтар сядзібных ансамбляў у Багародзіцку каля Тулы, Нікольскім-Гагарыне каля Масквы (абодва 1773—76), Тайцах (з 1774) і Сіворыцах (1775—76) пад Пецярбургам. З 1774 працаваў над рэканструкцыяй *Аляксандра-Неўскай лаўры*, пабудаваў там Троіцкі сабор. Найб. значная яго пабудова — *Таўрычаскі палац*. У пач. 1790-х г. працаваў на Украіне (сабор у Мікалаеве і інш.). З 1800 узначальваў буд. кантроль пры ўзвядзенні *Казанскага сабора* ў Пецярбургу. Сярод работ на Беларусі: тыпавы праект мураванага і драўлянага паштовага дома (1772; мураваныя дамы пабудаваны ў Віцебску, Магілёве, Полацку); праекты планіроўкі гасцінага двара, сядзібнага дома для рэзідэнцыі графа Р.А.Пацёмкіна і перабудовы Спаскай царквы (1784) у г. Дуброўна (Віцебская вобл.), праект палаца Пацёмкіна (канец 1780-х г.) і суднабуд. верфі (1785) у г. Крычаў (Магілёўская вобл.).

Літ.: Ключариванц Д.А. И.Старов. Л., 1982; Морозов В.Ф. Петербургские зодчие — Белоруссии // Ленингр. панорама. 1982. № 12. *В.Ф.Марозаў.*

СТА́РТАВЫ КО́МПЛЕКС касмадрома, частка *касмічнага комплексу*,



Стартавы комплекс касмадрома.

якая забяспечвае дастаўку *ракеты-носьбіта* з *касмічным апаратам* з тэхн. пазіцыі на стартавую, установку іх на пускавое ўстройства (стартавы стол), запраўку ракеты-носьбіта палівам, выпрабаванні, выкананне ўсіх тэхнал. аперацый па падрыхтоўцы да пуску, пуск, сачэнне на актыўным участку палёту. Уключае тэхнал. абсталяванне, збудаванні з тэхн. сістэмамі, пад'язныя пуці. Мае 1 ці некалькі пускавых установак, цэнтр кантролю і кіравання пускам, дапаможныя службовыя збудаванні і пляцоўкі. Бывае стацыянарны ці перасовачны. Адрозненне паміж С.к. вызначаецца тыпам ракет, якія з іх запускаюцца. Гл. таксама *Касмадром*. *У.С.Ларыёнаў.*

СТАРТСТО́ПНЫ АПАРА́Т (ад англ. start пачынаць, пускаць у ход + stop спыняць), літарадрукавальны *тэлеграфны апарат* з перарывістым вярчэннем перадавальнага і прыёмнага размеркавальных механізмаў. За 1 абарот размеркавальных механізмаў (перадавальнага і прыёмнага, якія працуюць сінхронна) перадаецца пускавая (стартавая) пасылка для запуску размеркавальнага механізма, код сімвала і стопавая пасылка для спынення механізма. У С.а. прадугледжваецца таксама аўтам. рэжым работы. Разнавіднасць С.а. — *тэлетайп*.

СТАРУ́ХА, возера ў Нараўлянскім р-не Гомельскай вобл., на правабярэжнай пойме р. Прыпяць, за 7 км на ПдУ ад г. Нароўля. Пл. 0,42 км^2, даўж. 3,1 км, найб. шыр. 150 м, даўж. берагавой лініі 7,3 км. Катлавіна старычнага тыпу. Схілы выш. 2—3 м, пад хмызняком. Берагі нізкія, пясчаныя. У возеры расце вадзяны арэх (занесены ў Чырвоную кнігу Беларусі).

СТАРУ́ХА, возера ў Петрыкаўскім р-не Гомельскай вобл., на левабярэжнай пойме р. Прыпяць, за 25 км на З ад г. Петрыкаў. Пл. 0,4 км^2, даўж. 3,1 км, найб. шыр. 140 м, даўж. берагавой лініі 6,7 км. Катлавіна старычнага тыпу. Берагі выш. да 0,8 м, пясчаныя, часткова пад хмызняком. Злучана ручаём з р. Прыпяць.

СТА́РЦАВА Ніна Іларыёнаўна (8.8.1925, в. Глінішча Гарадоцкага р-на Віцебскай вобл. — 16.1.1943), удзельніца камсам. падпольнай арг-цыі «*Маладая гвардыя*» ў г. Краснадон Луганскай вобл. (Украіна) у Вял. Айч. вайну. З 1937 жыла ў Краснадоне. З пач. вайны ў падполлі, з кастр. 1942 чл. «Маладой гвардыі», удзельніца шматлікіх дыверсій, выдання і распаўсюджання лістовак. У ліст. 1942 напярэдадні 25-годдзя Кастр. рэвалюцыі з падпольшчыкамі вывесіла чырв. сцягі на шахце і будынку бальніцы. 12.1.1943 арыштавана, мужна трымалася на допытах. Акупанты жывой скінулі яе ў 50-метровы шурф шахты.

СТА́РЦАВЫ, рускія архітэктары 2-й пал. 17 ст. Дзмітрый Міхайлавіч С. Будаваў (з 1671) гасціны двор у Архангельску, удзельнічаў у надбудове Троіцкіх варот Маскоўскага Крамля. Восіп Дзмітрыевіч С. (? — пасля 1714), сын і вучань Дзмітрыя Міхайлавіча. Працаваў у Маскве. Адзін з вядучых майстроў апошняга этапу развіцця стараж.-рус. дойлідства, у традыц. арх. формы ўводзіў багаты дэкор з выкарыстаннем паліванай шматкаляровай кафлі, разных белакаменных дэталей. У 1677—80 дабудоўваў трапезную Сіманава манастыра; у 1681—82 перабудоўваў цэрквы пры Церамным палацы ў Крамлі, аб'яднаўшы Верхаспаскі сабор (Спас за Залатой рашоткай), цэрквы Уваскрэсення Славушчага і Укрыжавання агульным карнізам і дахам з 11 купала-



Да арт. **Старцавы**. В.Дз.Старцаў. Царква Мікалая Цудатворца ў Маскве.

мі. Пабудаваў церамок на Святых варотах Круціцкага падвор'я (1693—94, з Л.Кавалёвым), царкву Мікалая Цудатворца на Балванаўцы (1697—1712; дэкор у духу маскоўскага барока).

СТА́РЦАЎ Аляксандр Валянцінавіч (н. 25.3.1946, с. Кіраўскае Хабараўскага краю, Расія), бел. вучоны ў галіне тэхн. кібернетыкі. Скончыў Мінскі радыётэхн. ін-т (1969). З 1976 у Ін-це тэхн. кібернетыкі Нац. АН Беларусі. З 1993 у акц. т-ве «Белкомдата». З 1997 у канцэрне «Белрэсурсы». Навук. працы па інфарм.-праграмным забеспячэнні аўтаматызаваных сістэм, тэхналогіі апрацоўкі відарысаў для спец. графічных комплексаў. Дзярж. прэмія СССР 1985. *М.П.Савік.*

СТАРЦЁР (англ. starter ад start пачынаць, пускаць у ход), 1) асноўны агрэгат пускавой сістэмы рухавіка ўнутранага згарання. Бываюць інерцыйныя, прамога дзеяння і камбінаваныя. Кіраванне С. непасрэднае (напр., націсканнем на педаль) і дыстанцыйнае. Аўтамаб. і трактарныя рухавікі запускаюцца пераважна эл. С., авіяцыйныя — пнеўматычнымі, эл. і інш. С. Гл. таксама *Пускавы рухавік*. 2) С. у святлатэхніцы —

прылада для запальвання *люмінесцэнтных лямпаў*.

СТА́РЦЫ, вёска, якая ў 1930-я г. ўвайшла ў склад г.п. *Кіраўск*.

СТА́РШЫ ЛЕЙТЭНА́НТ, воінскае званне малодшага афіцэрскага саставу ва ўзбр. сілах шэрагу дзяржаў, у т.л. ў Рэспубліцы Беларусь. У Рас. імперыі існавала ў 1907—17 толькі на флоце; у СССР з 1935 уведзена для камандназага складу сухап. войск, ВПС і ВМФ; адпавядала званню *палітрук*. Ва Узбр. Сілах Беларусі надаецца *лейтэнантам* пры адпаведнасці службовай катэгорыі, па заканчэнні вызначанага тэрміну выслугі ў папярэднім званні і інш. Званне С.л. існуе і ў шэрагу інш. сілавых структур. Гл. *Званні воінскія*. *В.А.Сергіенка.*

СТА́РШЫ МАТРО́С, воінскае званне ў ВМФ (ВМС) шэрагу дзяржаў, у т.л. ў Рэспубліцы Беларусь. У ВМФ і марскіх часцях пагран. войск СССР існавала з 1946. Ва Узбр. Сілах Беларусі ўведзена для карабельнага саставу пагран. войск і інш. (адпавядае званню яфрэйтар) і надаецца *матросам*, якія ўзорна выконваюць абавязкі па службе, маюць высокую воінскую дысцыпліну, а таксама пры прызначэнні на пасады, для якіх прадугледжана такое званне.

В.А.Сергіенка.

СТА́РШЫ ПРА́ПАРШЧЫК, воінскае званне *прапаршчыкаў*. Ва Узбр. Сілах СССР існавала з 1981, ва Узбр. Сілах Беларусі з 1992. Надаецца лепшым прапаршчыкам, якія праслужылі 5 гадоў, у т.л. не менш як 1 год на пасадзе С.п. або афіцэра, а таксама за бездакорную службу прапаршчыкам на працягу 15 гадоў незалежна ад займаемай пасады. Званне С.п. існуе і ў шэрагу інш. сілавых структур. Гл. *Званні воінскія*.

В.А.Сергіенка.

СТА́РШЫ СЯРЖА́НТ, воінскае званне сяржанцкага саставу. Ва Узбр. Сілах СССР існавала з 1940; у ВМФ адпавядала званне гал. старшына. Ва Узбр. Сілах Рэспублікі Беларусь надаецца лепшым *сяржантам*, якія праслужылі на сяржанцкіх пасадах не менш за 3 месяцы і пры прызначэнні на пасады, на якіх штатам прадугледжана званне С.с. Званне С.с. існуе і ў шэрагу інш. сілавых структур. Гл. *Званні воінскія*.

В.А.Сергіенка.

СТАРШЫ́НА, 1) воінскае званне сяржанцкага (старшынскага), падафіцэрскага і унтэр-афіцэрскага саставу ва ўзбр. сілах шэрагу дзяржаў. У СССР існавала з 1935; у ВМФ адпавядала званне гал. карабельны С. Ва Узбр. Сілах Рэспублікі Беларусь воінскае званне С. прысвойваецца лепшым *старшым сяржанам*, якія праслужылі на сяржанцкіх пасадах не менш як 6 месяцаў і пры прызначэнні на пасады, на якіх штатам прадугледжана званне С. Званне С. існуе і ў шэрагу інш. сілавых структур. Гл. *Званні воінскія*. 2) Службовая асоба ў роце (батарэі), у т.л. ва Узбр. Сілах Беларусі. З'яўляецца прамым нач. салдат і сяржантаў свайго падраздзялення. Падпарадкоўваецца камандзіру роты (батарэі) і ў адсутнасць афіцэра выконвае яго абавязкі.

В.А.Сергіенка.

СТАРШЫ́НА казацкая, катэгорыя службовых асоб у казацкіх войсках Украіны і Расіі ў 16—18 ст. Ажыццяўляла адм. і ваен. кіраўніцтва. Уключала *атаманаў, палкоўнікаў*, есаулаў, *сотнікаў*, суддзяў і інш. Падзялялася на генеральную (вайск.), палкавую і соценную. Выбіралася з асяродка заможных казакоў (у *Запарожскай Сечы* С. на чале з кашавым атаманам выбіралася вайск. радай). Узначальвала барацьбу супраць крымскіх татараў і туркаў, падтрымлівала дзеянні ўрадаў Рэчы Паспалітай і Расіі, выкарыстоўвалася ў барацьбе паміж рознымі паліт. групоўкамі, у ваен. сутыкненнях паміж суседнімі дзяржавамі і грамадз. вайне ў Расіі ў пач. 17 ст. (гл. *Смута*). Удзел казацтва ў *Булавінскім паўстанні 1707—09, Сялянскай вайне 1773—75*, дапамога шведам у час *Паўночнай вайны 1700—21* (гл. ў арт. *Мазепа*) прывялі да абмежавання яе самастойнасці (С. стала прызначацца ўрадам Расіі). У канцы 18 ст. многія дзеячы С. атрымалі афіцэрскія чыны, правы дваранства і інш. прывілеі. У 19 ст. тэрмін «С.» выйшаў з ужытку. Гл. таксама *Казакі, Казацкія летапісы*.

СТАРШЫНА́ ВАЛАСНЫ́, службовая асоба сялянскага грамадскага кіравання ў Рас. імперыі (у т.л. на Беларусі) з часу *сялянскай рэформы 1861* да Лют.рэвалюцыі 1917. Выбіраўся *валасным сходам* на 3 гады, зацвярджаўся *міравым пасрэднікам* (з 1889 — *земскім участковым начальнікам*). Абвяшчаў распараджэнні ўрада і наглядаў за іх выкананнем. Меў права штрафаваць сялян, накладваць арышт (да 2 сутак), прызначаць на грамадскія работы.

СТАРШЫ́НАЎ Мікалай Канстанцінавіч (6.12.1924, Масква — 6.2.1998), рускі паэт, перакладчык. Скончыў Літ. ін-т імя М.Горкага ў Маскве (1955). Друкаваўся з 1943. У паэт. зб-ках «Сябрам» (1951), «Пратока» (1966), «Асіннік» (1973), «Рака любові» (1976), «Ранні час» (1977), «Мілы млын» (1978), «Тваё імя» (1980), паэмах «Гвардыі радавы» (1947), «Сямёнаўна» (1973) і інш. пачуцці і думы пакалення, якое перажыло ў юнацтве Вял. Айч. вайну. Аўтар кн. апавяданняў «Белы камень» (1968), кн. пра творчасць «Памятны ўрок» (1980). Беларусі прысвяціў вершы «Ля Прыпяці», «Пратока». Пісаў пра А.Пысіна. На рус. мову пераклаў творы А.Вялюгіна, А.Русецкага, М.Танка. Асобныя вершы С. на бел. мову пераклалі К.Камейша, Ю.Свірка.

Тв.: Избранное. М., 1980.

СТАРЫ́ АСКО́Л, горад у Белгарадскай вобл. Расіі, на р. Аскол. Засн. ў канцы 16 ст. 214 тыс. ж. (2000). Вузел чыгунак і аўтадарог. Адзін з цэнтраў здабычы жал. руды *Курскай магнітнай анамаліі* (Стойленскі горна-абагачальны камбінат). Прам-сць: чорная металургія (эл.-металургічны камбінат), маш.-буд., цэм., харч., лёгкая. Краязнаўчы музей. Арх. помнікі 19 ст.

СТАРЫ́ БЫ́ХАЎ, назва г. *Быхаў* з 1-й пал. 17 ст. да 1-й пал. 19 ст.

СТАРЫ́ ВО́СТРАЎ, вёска ў Клічаўскім р-не Магілёўскай вобл., каля р. Бярэзіна. Цэнтр Акцябрскага с/с і калгаса. За 30 км на ПнЗ ад г.п. Клічаў, 121 км ад Магілёва, 21 км ад чыг. ст. Нясята. 415 ж., 160 двароў (2001). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

СТАРЫ́ ДВОР, вёска ў Варапаеўскім пас. Савеце Пастаўскага р-на Віцебскай вобл.; чыг. ст. Жафарава на лініі Паставы—Глыбокае. Цэнтр саўгаса. За 21 км на У ад г. Паставы, 247 км ад Віцебска. 366 ж., 143 двары (2001). Базавая школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

СТАРЫ́ ДВО́РАЦ, вёска ў Пархімаўскім с/с Беластавіцкага р-на Гродзенскай вобл., на аўтадарозе Ваўкавыск—Алекшыцы. Цэнтр калгаса. За 12 км на ПнУ ад г.п. Вял. Бераставіца, 52 км ад Гродна, 22 км ад чыг. ст. Бераставіца. 481 ж., 149 двароў (2001). Базавая школа, Дом культуры, б-ка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

СТАРЫ́ ЗАПАВЕ́Т, першая частка *Бібліі*, якая з'яўляецца Свяшчэнным пісаннем у *іудаізме* і *хрысціянстве*.

СТАРЫ́ КРУПЕ́Ц, вёска ў Добрушскім р-не Гомельскай вобл., на аўтадарозе Добруш—Церахоўка. Цэнтр Крупецкага с/с і калгаса. За 12 км на Пд ад горада і 10 км ад чыг. ст. Добруш, 40 км ад Гомеля. 855 ж., 320 двароў (2001). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, аддз. сувязі. Свята-Троіцкая царква. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

СТАРЫ́ МЯ́ДЗЕЛ, назва часткі г. *Мядзел* да 1921.

СТАРЫ́ СВЕ́РЖАНЬ, вёска ў Навасвержанскім с/с Стаўбцоўскага р-на Мінскай вобл., на аўтадарозе Стоўбцы—Іванцэвічы. Цэнтр калгаса. За 6 км на ПдЗ ад горада і чыг. ст. Стоўбцы, 81 км ад Мінска. 610 ж., 261 двор (2001). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, аддз. сувязі. Помнік архітэктуры — царква Раства Багародзіцы (1770).

СТАРЫ́ СВЕТ, агульная назва трох вядомых са старажытнасці частак свету — Еўропы, Азіі, Афрыкі. Звычайна процістаўляецца *Новаму Свету*.

СТАРЫ́ СТЫЛЬ, юліянскі каляндар, сістэма летазлічэння, якую ўвёў у 46 да н.э. рымскі імператар Юлій

Цэзар (адсюль назва — юліянскі каляндар). На змену С.с. ў 1582 прыйшоў грыгарыянскі каляндар, т.зв. *новы стыль*. Пра розніцу паміж новым і С.с. гл. ў арт. *Каляндар*.

СТАРЫ́ ТАЛАЧЫ́Н, гл. ў арт. *Талачын*.

СТАРЫ́ УЛА́С (сапр. Сівы-Сівіцкі Уладзіслаў Пятровіч; 23.3.1865, г. Валожын Мінскай вобл. — 30.9.1939), бел. пісьменнік, фальклярыст. Служыў кухарам, аб'ездчыкам, ляснічым. Друкаваўся з 1909 у газ. «Наша ніва». Апрацоўваў нар. паданні і легенды. Аўтар парадыйна-сатыр. вершаванага апавядання «Тры зладзеі» (1912). У паэме «Год беларуса» (1910) паказаў побыт і працу сялян. Пісаў пра іх цяжкае жыццё. У творах уплыў бел. фальклору. Рукапісы С.У. ў архівах Беларусі, Літвы, Польшчы.



Стары Улас.

Тв.: Год беларуса. Мн., 1990.

Літ.: Каханоўскі Г. Адчыніся, таямніца часу. Мн., 1984.

СТАРЫ́ ШКЛОЎ, гл. ў арт. *Шклоў*.

СТАРЫ́К, возера ў Петрыкаўскім р-не Гомельскай вобл., на левабярэжнай пойме р. Прыпяць, за 13 км на У ад г. Петрыкаў. Пл. 0,4 км^2, даўж. 3,3 км, найб. шыр. 150 м, даўж. берагавой лініі 6,7 км. Катлавіна старычнага тыпу. Схілы выш. 4—5 м, на З і Пн пад хмызняком, на У разараныя. Злучана пратокай з р. Прыпяць.

СТАРЫ́К, возера ў Быхаўскім р-не Магілёўскай вобл., на левабярэжнай пойме р. Дняпро, за 12 км на ПдУ ад г. Быхаў. Пл. 0,3 км^2, даўж. 5,7 км, найб. шыр. 80 м, даўж. берагавой лініі 11,7 км. Катлавіна старычнага тыпу. Берагі выш. 1—1,2 м, пад лугам. Злучана ручаём з р. Дняпро.

СТА́РЫКАВА Клаўдзія Фёдараўна (н. 26.12.1935, г. Снежнае Данецкай вобл., Украіна), бел. спявачка (лірыка-драм. сапрана). Засл. арт. Беларусі (1972). Скончыла Харкаўскі ін-т мастацтваў (1965). З 1965 салістка Дзярж. т-ра оперы і балета Беларусі, з 1976 — Варашылаўградскай і Харкаўскай абл. філармоній. Валодае голасам прыгожага тэмбру, шырокага дыяпазону. Для выканальніцкай манеры ўласцівы эмацыянальнасць, шчырасць, сцэнічная абаяльнасць. Сярод партый на бел. сцэне: Тася («Андрэй Касценя» М.Аладава), Яраслаўна («Князь Ігар» А.Барадзіна), Ліза, Таццяна («Пікавая дама», «Яўген Анегін» П.Чайкоўскага), Наташа («Русалка» А.Даргамыжскага), Аіда, Леанора, Дэздэмона («Аіда», «Трубадур», «Атэла» Дж.Вердзі), Тоска, Чыо-Чыо-сан (аднайм. оперы Дж.Пучыні). Лаўрэат міжрэсп. конкурсу вакалістаў рэспублік Прыбалтыкі і Беларусі (1968).

Б.С.Смольскі.

СТАРЫНА́, вёска ў Шашкоўскім с/с Стаўбцоўскага р-на Мінскай вобл., каля р. Сула. Цэнтр калгаса. За 23 км на ПнЗ ад горада і чыг. ст. Стоўбцы, 98 км ад Мінска. 363 ж., 126 двароў (2001). Базавая школа, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

«СТАРЫНА́», тэрмін, які ў часы ВКЛ адпавядаў значэнням «традыцыі», «звычаі», што ў значнай ступені рэгулявалі прававое, сац.-эканам. і паліт. становішча пэўных класаў, сац. груп, асоб. Для феадалаў у многіх выпадках «С.» — сінонім даўнасці, якой яны абгрунтоўвалі свае паліт. прывілеі, права на зямлю і сялян. Сяляне і мяшчане атаясамлівалі «С.» са звычаямі, традыцыямі. У барацьбе супраць увядзення «навін», якія абцяжарвалі прававое становішча сялян, апошнія выкарыстоўвалі разнастайныя формы барацьбы (скаргі вял. князю, уцёкі ад сваіх гаспадароў, адмаўленне выконваць павіннасці і інш.). Гэта вымушала велікакняжацкую адміністрацыю прымаць пэўныя захады да захавання «С.». Жыгімонт III у Статуце ВКЛ 1588 урачыста абяцаў усім падданым захоўваць у непарушнасці даўнія звычаі, не ўводзіць новых павіннасцей і інш. Аднак як буйны землеўласнік вял. князь не мог не лічыцца з інтарэсамі феадалаў, якія імкнуліся захоўваць ранейшыя павіннасці залежнага ад іх насельніцтва і ўводзіць новыя. Таму некаторыя ноўаўвядзенні ўносіліся ў граматы і праз пэўны час набывалі сілу «С.». Гл. таксама *Звычай*.

В.Ф.Голубеў.

СТАРЫ́НКАЎСКІ ЧЫГУНАЛІЦЭ́ЙНЫ ЗАВО́Д (вядомы і як Уладзімірскі). Дзейнічаў з канца 18 ст. да 1872 у в. Старынка Чэрыкаўскага пав. (цяпер Слаўгарадскі р-н Магілёўскай вобл.). Засн. як медзеплавільня. У 1835 пабудавана невял. домна для выплаўкі чыгуну з мясц. балотнай руды. У 1839 з-д расшыраны, выпускаў медныя абшыўкі і парахавыя скрынкі для Чарнаморскага ваен. флоту, карабельныя балты. З 1847 вырабляў павозкі, лафеты, платформы для арміі, восі для гармат, паравыя машыны для Бранскага арсенала. У 1858—62 быў адным з буйнейшых металург. прадпрыемстваў еўрап. ч. Рас. імперыі. У 1863 працавала каля 900 рабочых. Ад з-да да р. Сож (5—6 км) была пракладзена чыгунка-вузкакалейка.

СТАРЫ́НКІ, вёска ў Дзяржынскім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 10 км на ПнЗ ад г. Дзяржынск, 48 км ад Мінска, 12 км ад чыг. ст. Койданава. 191 ж., 95 двароў (2001). Кааператыў «Ветразь». Клуб, б-ка, аддз. сувязі, Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

СТАРЫ́НСКІ ВЯЛІ́КІ КА́МЕНЬ, геалагічны помнік прыроды рэсп. значэння (з 1996). Размешчаны за 2,1 км на З ад в. Прошкава Глыбоцкага р-на Віцебскай вобл. Назва ад б. хутара Старына. Шаравата-жоўты гнейс з пражылкамі кварцу і палявога шпату (да 10 см). Даўж. 3,9 м, шыр. 1,8 м, выш. 1,6 м, у абводзе 9,1 м, аб'ём 11,2 м^3, маса 30 т. Прынесены ледавіком 20—15 тыс. гадоў назад са Скандынавіі.

В.Ф.Вінакураў.

СТА́РЫЦА, старарэчча, старык, участак былога рэчышча, які поўнасцю ці часткова аддзяліўся ад ракі. Утвараецца ў выніку прарыву ракой шыйкі *меандра* або пры драбленні рэчышча на рукавы ў выніку яго блукання на алювіяльнай пойме. Мае падковаўі дугападобную, радзей прамалінейную форму. Найб. спрыяльныя ўмовы ўтварэння С. у рачных далінах з добра развітым свабодным меандраваннем рэчышча, плоскім шырокім дном і стабільным падоўжным профілем ракі, блізкім да профілю раўнавагі. На Беларусі найб. колькасць С. у далінах р. Прыпяць і яе прытокаў першага парадку.



Схема ўтварэння **старыцы**.

СТА́РЫЦА, ландшафтны заказнік рэсп. значэння ў Быхаўскім р-не Магілёўскай вобл. Засн. ў 1997 для аховы спецыфічных поймавых ландшафтаў у даліне р.

Дняпро. Пл. 2033 га. Прадстаўлены элементы значна пераўтворанай даліны — стромныя і пакатыя схілы, фрагменты тэрас, эолавых пагоркаў і град, старыцавых азёр, меандрыруючыя рэчышчы. Заказнік уключае 27 азёр серпападобнай формы і воз. Старыца. У флоры 308 відаў сасудзістых раслін, у т.л. ў Чырв. кнізе вадзяны арэх плывучы. Растуць па-за межамі сваіх арэалаў вольха шэрая, вяз коркавы, уман звычайны. Шмат гаспадарча карысных відаў. У фауне вял. доля антрапаталерантных відаў, многа відаў птушак. У Чырв. кнізе варакушка, з насякомых — жужалі рашэцісты і фіялетавы, пераліўніца вялікая.

ПІ.Лабанок.

СТАРЫ́ЦКІ Міхаіл Пятровіч (14.12.1840, с. Клешчынцы Чарнабаеўскага р-на Чаркаскай вобл., Украіна — 27.4.1904), украінскі пісьменнік, перакладчык, тэатр. дзеяч. Вучыўся ў Харкаўскім (1858—60) і Кіеўскім (1860—66) ун-тах. З 1864 выступаў у аматарскіх тэатр. гуртках. З 1883 узначальваў першую ўкр. прафес. тэатр. трупу М.*Крапіўніцкага* (у 1880—90-я г. гастраліравала на Беларусі). Майстэрствам трупы захапляліся Я.Лучына, які прысвяціў трупе вершы «Усёй трупе дабрадзея Старыцкага беларускае слова» і «Дабрадзею артысту Манько» (нап. 1887, апубл. 1932), і Ф.Багушэвіч. С. — майстар рэжысёрскага вырашэння масавых сцэн, асаблівую ўвагу аддаваў муз. і маст. афармленню спектакля. Аўтар зб. вершаў «Са старога сшытка. Песні і думы» (ч. 1—2, 1881—83), сац.-быт. п'ес «Не суджана» (1883), «У цемры» (1893), «Лёс» (1894), гіст. драм «Багдан Хмяльніцкі» (1897), «Маруся Багуслаўка» (1899), вадэвіляў. Трылогія «Багдан Хмяльніцкі» («Перад бурай», «Бура», «Каля прыстані», 1895—97), аповесць «Абарона Бушы» (1894) пра падзеі антыфеад. вайны ўкр. і бел. народаў 1648—54. Інсцэніраваў творы М.Гогаля, Э.Ажэшкі, Ю.Крашэўскага і інш. На ўкр. мову пераклаў некат. творы А.Пушкіна, М.Лермантава, М.Някрасава, Ю.Славацкага, А.Міцкевіча, У.Сыракомлі, І.В.Гётэ, Дж.Байрана. На бел. мову асобныя творы С. пераклаў Э.Валасевіч.

Тв.: Твори. Т. 1—8. Київ, 1963—65; Рус. пер. — Пьесы. Л.; М., 1958; Стихи. М., 1965.

Літ.: Сокирко Л.Г. М.П.Старицький. Київ, 1960; Комишанченко М. М.Старицький. Київ, 1968. *І.У.Саламевіч.*

СТА́РЫЦКІ БОЙ 1942, бой атрадаў партыз. брыгады імя Варашылава з карнай экспедыцыяй ням. фашыстаў у Старыцкім лесе Капыльскага р-на Мінскай вобл. 7 ліст. ў Вял. Айч. вайну. Гітлераўцы з мэтай знішчэння партыз. гарнізона сканцэнтравалі ў гэтым раёне паліцэйскі полк, 2 ахоўныя батальёны, артыл. і танк. роты, роту сувязі; размясціўшы іх у в. Заполле, Слабада-Кучынка, Свідзічы, Русакі, адрэзалі партызанам шлях на З. Пасля артпадрыхтоўкі гал. сілы карнікаў тройчы няўдала спрабавалі прарвацца з Пд і У на пазіцыі атрадаў імя Шчорса і імя Чапаева. На дапамогу Старыцкаму гарнізону з Вялешынскага лесу падышоў атрад імя Катоўскага, які разбіў аўтакалону гітлераўцаў і ўдарыў па карніках з тылу. Калі скончыліся боепрыпасы, усе партызаны адышлі ў Вялешынскі лес. Карная аперацыя гітлераўцаў супраць партызан была сарвана.

СТАРЫЧО́НАК Васіль Дзянісавіч (н. 24.2.1954, в. Луцішча Крупскага р-на Мінскай вобл.), бел. мовазнавец, літаратуразнавец. Д-р філал. н. (1998). Скончыў БДУ (1976). З 1976 у Ін-це мовазнаўства АН Беларусі, з 1980 у Бел. пед. ун-це імя М.Танка (з 1998 праф., з 2001 дэкан). Даследуе пытанні бел. лексікалогіі і дыялекталогіі, граматыкі і фаналогіі мовы. Аўтар «Слоўніка амонімаў беларускай мовы» (1991), кніг «Полісемія ў беларускай мове (на матэрыяле субстантываў)», «Лінгвістычныя аналізы» (абедзве 1997), дапаможнікаў па л-ры і мове для школ і абітурыентаў, сааўтар «Слоўніка беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яе пагранічча» (т. 1, 1979, т. 3—5, 1982—86), «Лексічнага атласа беларускіх народных гаворак» (т. 1—3, 1993—96, т. 5, 1998), кн. «Асновы фаналогіі» (1998) і інш. Займаецца метадычнай распрацоўкай лінгвістычных аналізаў, займальнай філалогіяй («Займальная філалогія», 1998). *М.Н.Крыўко.*

СТАРЫ́Я ГА́БЫ, вёска ў Мядзельскім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 30 км на У ад г. Мядзел, 140 км ад Мінска, 18 км ад чыг. ст. Крывічы. 435 ж., 176 двароў (2001). Сярэдняя школа-сад, Дом культуры, б-ка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Помнік архітэктуры — Свята-Мікалаеўская царква (1905).

СТАРЫ́Я ДАРО́ГІ, горад, цэнтр Старадарожскага р-на Мінскай вобл. Чыг. ст. на лініі Баранавічы—Асіповічы, на аўтадарозе Бабруйск— Слуцк. За 148 км ад Мінска. 12,1 тыс. ж. (2001).

Вядомыя з 1524 як сяло Дарогі Глускай вол. ў ВКЛ. Уласнасць Гальшанскіх, Хадкевічаў, Алелькавічаў, Радзівілаў, Вітгенштэйнаў, з 1846 дзярж. ўладанне. З 1565 у Навагрудскім ваяв. З канца 16 ст. мястэчка на Слуцка-Бабруйскім тракце. У канцы 17 ст. за 6 км на У утварылася аднайм. паселішча, таму мястэчка атрымала назву С.Д. З 1791 у Случарэцкім пав. Навагрудскага ваяв. З 1793 у Рас. імперыі, вёска, з 1861 у Новадарожскай вол. Бабруйскага пав. У 1886—271 ж., 40 двароў. З 1896 за 2 км на З заснавана аднайм. чыг. станцыя Лібава-Роменскай чыгункі, новае паселішча вакол яе дало пачатак сучаснаму гораду С.Д. З 17.7.1924 цэнтр *Старадарожскага раёна*. З 27.9.1938 — горад. 28.6.1941 акупіраваны ням. фашыстамі, якія ў горадзе і раёне загубілі 1423 чал., разбурылі горад; дзейнічала *Старадарожскае патрыятычнае падполле*. Вызвалены 28 чэрв. воінамі 1-га Бел. фронту ў ходзе *Бабруйскай аперацыі 1944*.



Забудова вуліцы Пралетарскай у г. **Старыя Дарогі**.

Працуюць масла-, хлеба-, пладова-агароднінны, мех. з-ды, цэх безалкагольных напіткаў, швейная ф-ка, лясгас; 4 сярэднія, мастацтваў, спарт., завочная школы, дзіцячы дом, Дом культуры, *Старадарожскі мастацкі музей*, 2 б-кі, бальніца, паліклініка, камбінат быт. паслуг; дзейнічае Свята-Мікалаеўская царква. Брацкія магілы сав. воінаў і партызан. Помнікі: Вызвалення, воінам-вызваліцелям, партызанкам-падпольшчыцам Г.Каралёвай і С.Бабаковай, ахвярам фашызму «Рэквіем», воінам-афганцам.

Літ.: Памяць: Гіст.-дак. хроніка Старадарожскага р-на. Мн., 1998. *В.Л.Насевіч.*

СТАРЫ́Я ДЗЯ́ТЛАВІЧЫ, вёска ў Гомельскім р-не, каля р. Сож. Цэнтр Дзятлавіцкага с/с і калект.-долевай гаспадаркі. За 35 км на ПдЗ ад Гомеля. 326 ж., 151 двор (2001). Лясніцтва. Базавая школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, аптэка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў. Магіла ахвяр фашызму.

СТАРЫ́Я ЖУРА́ВІЧЫ, гл. *Журавічы*.

СТАРЫ́Я ЦЯРУ́ШКІ, вёска ў Зажэвіцкім с/с Салігорскага р-на Мінскай вобл. Цэнтр калгаса. За 15 км на У ад горада і чыг. ст. Салігорск, 145 км ад Мінска. 649 ж., 333 двары (2001). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, аддз. сувязі. Малітоўны дом евангельскіх хрысціян-баптыстаў. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

СТАРЫ́Я ЮРКО́ВІЧЫ, вёска ў Ляхаўскім с/с Любанскага р-на Мінскай вобл. Цэнтр калгаса. За 20 км на Пд ад г. Любань, 172 км ад Мінска, 45 км ад чыг. ст. Урэчча. 586 ж., 200 двароў (2001). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Каля вёскі доўгачасовае паселішча (ад часоў неаліту да эпохі феадалізму).

СТАРЭ́ВІЧ Уладзіслаў Аляксандравіч (8.8.1882, Масква — 1965), расійскі мастак, аператар, рэжысёр, заснавальнік рас. анімацыйнага кіно. Адкрыў тэхн. прынцып аб'ёмнай мультыплікацыі, першы з рас. кінематаграфістаў звярнуўся да графічнай мультыплікацыі. З 1919 жыў і працаваў у Францыі. Сярод лепшых фільмаў: «Помста кінематаграфічнага аператара» (1912), «Страказа і мурашка» (1913), «Певень і Пегас» (1914), «Маленькі народ» (1930),

«Рэйнеке-Ліс» (1939), «Кветка папараці» (1949, прыз Міжнар. кінафестывалю ў Венецыі) і інш. З 1913 ставіў ігравыя фільмы, здымаўся як акцёр. Распрацаваў шматлікія прыёмы аператарскага мастацтва, трукавыя і камбінаваныя здымкі.

СТАРЭ́ННЕ, агульнабіялагічны працэс узроставых змен у арганізме, які прыводзіць да зніжэння жыццяздольнасці і павелічэння верагоднасці *смерці*. Уласціва ўсім арганізмам і адбываецца на ўсіх узроўнях арганізацыі жывога — ад малекулярна-генет. да арганізменнага. Развіваецца гетэрахронна (з рознай хуткасцю ў розных клетках, тканках, органах) і гетэратопна (неаднолькавыя якасныя змены ў розных структурах). Вядучыя механізмы С. на клетачным узроўні: дэградацыя і гібель ч. клетак, зніжэнне мітатычнай актыўнасці і колькасці мітахондрый, разбурэнне лізасом, змена эл. уласцівасцей плазматычных мембран, паніжэнне лабільнасці клетак і памяншэнне адэкватных рэакцый на фізіялагічна актыўныя рэчывы. Вядучыя механізмы на арганізменным узроўні (для вышэйшых жывёл): аслабленне функцый асн. фізіял. сістэм арганізма (нерв., эндакрыннай, сардэчна-сасудзістай, стрававальнай і інш.), зніжэнне нерв. кантролю над іх дзейнасцю, змена рэактыўнасці на ўздзеянне гармонаў, парушэнні на этапе паступлення інфармацыі ў нерв. цэнтры. Агульнапрынятыя тлумачэнні працэсаў С. адсутнічаюць. Існуе мноства гіпотэз, у адпаведнасці з большасцю іх — першасныя механізмы С. звязаны са зменай генет. апарата клеткі. У ходзе жыцця ў арганізме мабілізуюцца прыстасавальныя механізмы, якія тармозяць працэсы С. і спрыяюць павелічэнню працягласці жыцця. У чалавека высокі ўзровень сацыяльна-прац. актыўнасці і пастаянныя трэніроўкі спрыяюць захаванню разумовай і фіз. працаздольнасці да глыбокай старасці. Навука аб С. — *геранталогія*.

. У р а с л і н, як і ў жывёл, наступленне С. звязана са зніжэннем інтэнсіўнасці асн. функцый у клетках і тканках, актыўнасці анабалічных ферментаў і павышэннем гідралітычнай актыўнасці. У выніку назапашваюцца канечныя прадукты метабалізму і адбываюцца структурныя парушэнні арганоідаў клеткі (мітахондрый, хларапластаў і інш.). Спецыфіка многаклетачных раслін у тым, што С. клетак, тканак і цэлых органаў не прыводзіць да С. ўсяго арганізма адразу, таму што на працягу жыцця адначасова з адмяраннем органаў у раслін адбываецца іх новаўтварэнне. Найб. выяўлена С. ў адна-, двух- і шматгадовых *монакарпічных раслін*, у якіх пасля плоданашэння пачынаюцца неабарачальныя дэструктыўныя змены. У полікарпічных многалетнікаў парастковая і каранёвая сістэмы пастаянна амалоджваюцца. Прыкметы С. цэлага арганізма паяўляюцца ў іх, калі колькасныя дэструктыўныя працэсы пераважаюць над новаўтварэннямі (у дрэў утвараюцца дуплы, у цэнтры кустоў і дзярнін — прагаліны і інш.). Выраджэнне некат. культ. сартоў многалетнікаў пры вегетатыўным размнажэнні звязана са С. іх клонаў.

Літ.: Биология старения. Л., 1982; Г и л ь б е р т С.Ф. Биология развития: Пер. с англ. Т. 3. М., 1995; Л е о н т ю к А.С., С л у к а Б.А. Основы возрастной гистологии. Мн., 2000. *А.С.Леанцюк.*

СТАРЭ́ННЕ МАГНІ́ТНАЕ, змена магн. уласцівасцей *ферамагнетыкаў* і *феры-магнетыкаў* з цягам часу.

Адрозніваюць С.м. абарачальнае і неабарачальнае. А б а р а ч а л ь н а е С.м. абумоўлена перабудовай даменнай структуры (гл. *Дамены*) у выніку знешніх уздзеянняў: пастаянных і пераменных магн. палёў, ваганняў т-ры, мех. вібрацый, радыяцыі і інш. Паўторнае намагнічванне ўстараняе вынікі абарачальнага С.м. і аднаўляе першапачатковую намагнічанасць. Н е а б а р а ч а л ь н а е С.м. звязана са структурным старэннем рэчыва — зменай крышт. структуры, дысперснасці фаз і інш. элементаў структуры ў выніку дыфузіі, распаду цвёрдага раствору, упарадкавання і інш. Для павышэння магн. стабільнасці вырабаў праводзяць штучнае старэнне. Напр., для стабілізацыі крышт. структуры вырабы вытрымліваюць пры павышанай т-ры; для стабілізацыі даменнай структуры пастаянных магнітаў іх часткова размагнічваюць пераменным полем з амплітудай, якая спадае да нуля. Звычайна выкарыстоўваюць той від уздзеяння, якому выраб павінен процістаяць у працэсе эксплуатацыі.

Літ.: Гл. пры арт. *Магнітныя матэрыялы*. *Р.М.Шахлевіч.*

СТАРЭ́ННЕ МЕТА́ЛАЎ, змена структуры і ўласцівасцей металаў (асабліва сплаваў), якое адбываецца самаадвольна ў звычайных умовах (натуральнае старэнне) або пры награванні (штучнае). Асн. працэс пры С.м. — распад перанасычанага цвёрдага раствору, які атрымліваецца, як правіла, пры загартоўцы сплаву.

С.м. суправаджаецца звычайна павышэннем трываласці, цвёрдасці, каэрцытыўнай сілы, электраправоднасці металу (сплаву), а таксама зніжэннем яго пластычнасці і ўдарнай вязкасці. Адмоўны ўплыў С.м. прадухіляюць больш дасканалай тэхналогіяй выплаўкі металу (сплаву), яго легіраваннем, спец. тэрмічнай апрацоўкай. Штучнае С.м. (дасягаецца пластычным дэфармаваннем, радыеактыўным абпрамяненнем, лазернай і ультрагукавой апрацоўкай і інш.) ужываюць для павышэння трываласці сталей, алюмініевых, медных, тытанавых і інш. сплаваў, паляпшэння характарыстык магнітна-цвёрдых матэрыялаў. Працэсы С.м. вывучае *металазнаўства*. *Л.А.Касноўскі.*

СТАРЭ́ННЕ ПАЛІМЕ́РАЎ, неабарачальная змена (пагаршэнне) уласцівасцей палімераў і палімерных матэрыялаў пад уздзеяннем знешніх фактараў (цяпла, святла, вільгаці, іанізавальных выпрамяненняў і інш.). Адбываецца пры перапрацоўцы і захоўванні палімераў, а таксама эксплуатацыі вырабаў з іх.

Абумоўлена хім. ператварэннямі макрамалекул, якія прыводзяць да іх дэструкцыі (гл. *Дэструкцыя палімераў*) і да ўтварэння разгалінаваных ці трохвымерных структур («сшывання»). Паводле фактару, што ініцыіруе хім. працэсы, адрозніваюць С.п. пад уздзеяннем цяпла (тэрмічнае), святла (светлавое, ці фотастарэнне), кіслароду (акісляльнае), іанізавальных выпрамяненняў (радыяцыйнае), С.п. у агрэсіўным хім. асяроддзі (хемадэструкцыя) і інш. Звычайна С.п. адбываецца пад уздзеяннем комплексу знешніх фактараў (напр., атм. старэнне), а таксама пры спалучэнні любых відаў С.п. з акісленнем кіслародам паветра. Найб. пашырана тэрмаакісляльнае С.п., якое звязана з *ланцуговай хімічнай рэакцыяй* акіслення палімера пры награванні ў паветры. Важны фактар, які паскарае старэнне, — мех. напружанні, што ўзнікаюць у палімерах пры іх мех. перапрацоўцы і пры пэўных умовах эксплуатацыі вырабаў (гл. *Механахімія палімераў*). Фіз. працэсы (напр., крышталізацыя палімера, дэсорбцыя з матэрыялу фарбавальніка, пластыфікатару і інш. дабавак) таксама прыводзяць да змены ўласцівасцей палімераў і ўзнікнення мех. напружанняў. Скорасць С.п. залежыць не толькі ад знешніх фактараў і інтэнсіўнасці іх уздзеяння, але і ад хім. будовы, структуры і тэхналогіі атрымання палімераў і матэрыялаў. С.п. прыводзіць да страты комплексу карысных уласцівасцей, растрэсквання, часам да поўнага разбурэння вырабаў. Для памяншэння ці ліквідацыі шкоднага ўплыву старэння выкарыстоўваюць розныя спосабы *стабілізацыі палімераў* і палімерных матэрыялаў. *М.Р.Пракапчук.*

СТАРЭ́ЎСКІ ШКЛОЗАВО́Д. Дзейнічаў у 1897—1925 у в. Старэва Бабруйскага пав. (цяпер у Слуцкім р-не, Мінскай вобл.). Вырабляў шкляныя лямпы выдзіманыя і прасаваныя, лямпавае шкло, чарніліцы, бутэлькі, слоікі, хрустальныя вырабы. У 1910 меў паравы рухавік і паравы кацёл. У 1913—16 належаў «Таварыству Старэўскага хрустальнага і лесапільнага з-даў». У 1913 працавала 108 рабочых. У 1908 на міжнар. выстаўцы ў Марселі (Францыя) прадукцыя з-да адзначана Гран-пры.

СТАРЭ́ЧАЯ ДАЛЬНАЗО́РКАСЦЬ, тое, што *прэсбіяпія*.

СТА́САЎ Васіль Пятровіч (4.8.1769, Масква — 5.9.1848), рускі архітэктар; прадстаўнік позняга *класіцызму*. Акад.



В.П.Стасаў.

Пецярбургскай АМ (1811). У 1783—94 пам. архітэктара ў Маскоўскай управе дабрачыннасці. У 1802—08 вывучаў архітэктуру ў Францыі і Італіі. З 1808 працаваў у Пецярбургу, з 1816 чл. К-та для пабудоў і гідраўлічных работ, з 1817 кіраваў буд-вам пры імператарскім двары. Выканаў больш за 100 узорных праектаў жылых дамоў, агароджаў і гасп. пабудоў для правінцыі (1810-я г.). Найб. значныя работы ў Пецярбургу: б. Паўлаўскія казармы (1817—20; ч. ансамбля *Марсава поля*), Праабражэнскі (1827—29) і Троіцкі (1832—35) саборы, Нар-

венскія (1827—34, медная каляснiца — П.К.Клот, С.Піменаў) і Маскоўскія (1834—38, скульпт. дэкор Б.Арлоўскага) трыумфальныя вароты; дабудова сабора і зах. карпусоў келляў Смольнага манастыра, афармленне іх інтэр'ераў (1832—35); аднаўленне пасля пажару 1837 фасадаў, парадных залаў і цэрквы *Зімняга палаца*. У Царскім сяле (цяпер г. *Пушкін*) стварыў чыг. вароты «Любым маім таварышам па службе» (1817—21), манеж (1819—21), вял. аранжарэю (1820—23), канюшы корпус (1823), у Маскве правіянцкія склады. У творчасці развіваў ідэі і кампазіцыйныя прыёмы апошняга этапу класіцызму — *ампіру*, часта звяртаўся да строгіх форм дарычнага ордэра, ствараў арх. вобразы ўрачыстага гучання.

Літ.: Пилявский В.И. Стасов-архитектор. Л., 1963; Яго ж. Зодчий В.П.Стасов (1769—1848). Л., 1970.

СТА́САЎ Уладзімір Васілевіч (14.1.1824, С.-Пецярбург — 23.10.1906), рускі маст. і муз. крытык, гісторык мастацтва. Сын В.П.*Стасава*. Ганаровы чл. Рас. АН (1900). Скончыў Вучылішча правазнаўства (1843). З 1872 заг. маст. аддзела Публічнай б-кі (цяпер Публічная б-ка імя М.Салтыкова-Шчадрына). З 1847 публікаваў у друку артыкулы па л-ры, мастацтве, музыцы. Выступаў супраць *акадэмізму*, быў прыхільнікам рэаліст. мастацтва, дэмакратызацыі маст. жыцця. Актыўна ўдзельнічаў у творчым жыцці Арцелі мастакоў, Т-ва *перасоўнікаў*, кампазітараў «Новай рус. муз. школы», названай ім «*Магутнай кучкай*». Даследаваў і прапагандаваў творчасць М.Глінкі (больш за 30 работ). Аўтар манаграфій пра кампазітараў А.Барадзіна, М.Мусаргскага, мастакоў М.Антакольскага, К.Брулова, В.Верашчагіна, М.Ге, А.Іванава, І.Крамскога, В.Пярова, І.Рэпіна, творчых партрэтаў



У.В.**Стасаў**. Скульптар М.Антакольскі. 1872—75.

майстроў выканальніцкага мастацтва (А.Рубінштэйна і інш.). Адзін з першых пачаў збіраць і публікаваць эпісталярную спадчыну рус. мастакоў і кампазітараў.

Тв.: Избр. соч. Т. 1—3. М., 1952; Письма к родным. Т. 1—3. М., 1953—62; Статьи о музыке. Вып. 1—5. М., 1974—80.

Літ.: Лебедев А.К., Солодовников А.В. В.В.Стасов. М., 1982.

СТА́СЕВА, вёска ў Лёзненскім р-не Віцебскай вобл., на р. Вольша, каля аўтадарогі Віцебск—Лёзна. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 12 км на ПнЗ ад г.п. Лёзна, 30 км ад Віцебска, 11 км ад чыг. ст. Выдрэя. 200 ж., 98 двароў (2001). Лясніцтва. Пач. школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Вайсковыя могілкі сав. афіцэраў, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

СТАСЕ́ВІЧ Барыс Іванавіч (14.12.1895, г. Брэст — 1938), партыйны і дзярж. дзеяч БССР. Вучыўся ў духоўнай семінарыі і БДУ. З 1914 у арміі. З 1919 у Чырв. Арміі, удзельнік грамадз. вайны. З 1920 у Мінску: нам. нач. аддзела губхарчкома, нам. наркома ўнутр. спраў БССР. Са снеж. 1922 сакратар Мінскага павятовага к-та КП(б)Б, заг. аддзела Слуцкага акр. к-та партыі. У 1924—28 сакратар Аршанскага акругкома КП(б)Б. У 1928—29 сакратар ЦК КП(б)Б. З 1929 у Маскве: у Прафінтэрне, заг. Балканскай секцыі. Чл. ЦВК БССР (1922—30). Чл. ЦК КП(б)Б (1927—30), чл. Бюро ЦК КП(б)Б (1928—29). У 1938 беспадстаўна арыштаваны органамі НКУС СССР, расстраляны ў Маскве. У 1956 рэабілітаваны. *Э.А.Карніловіч.*

СТАСЕ́ВІЧ Іван Нічыпаравіч (9.1.1929, в. Мядзведня Старадарожскага р-на Мінскай вобл. — 11.9.1998), бел. жывапісец. Засл. дз. маст. Беларусі (1980). Скончыў Мінскае маст. вучылішча



І.**Стасевіч**. Партрэт Маршала Савецкага Саюза Г.К.Жукава. 1973.

(1952), Маскоўскі маст. ін-т імя В.Сурыкава (1958). У 1958—95 выкладаў у Бел. тэатр.-маст. ін-це (з 1980 праф.). Пісаў сюжэтна-тэматычныя карціны, пейзажы, нацюрморты. Творам характэрны стрыманасць каларыту, манументалізацыя вобразнага ладу. У палотнах «У беларускіх балотах» (1958), «Брэсцкая крэпасць» (1961), «Няскораныя» (1966), «Клятва» (1967), «Радасная сустрэча» (1968), «Суровае юнацтва» (1971), «Плачуць бярозы» (1975), «Вызваленне Барысаўшчыны» (1980), «За Беларусь. Аперацыя «Багратыён» (1984) і інш. увасоблена тэма Вял. Айч. вайны. Тэме працы прысвечаны карціны «Ангара-Ангара» (1960), «Шахцёры Салігорска» (1963), «Полацкі нафтазавод» (1975) і інш. Аўтар партрэтаў Героя Сац. Працы І.М.Сакольчыка (1972), Маршала Савецкага Саюза Г.К.Жукава (1973), «Сын палка. В.Дончык» (1974), лётчыка Г.Лі (1975), Г.У.Юшкевіча і Героя Сав. Саюза В.З.Каржа (1978), «Партызаны, партызаны... (партрэт Я.Купалы)» (1980), мастака А.Бембеля (1983) і інш. Стварыў цыклы краявідаў Мурманска (1955), Байкала (1956), Наўгародчыны (1971—75), Ленінграда (1973), Браслаўшчыны (1975), В'етнама (1985), шэраг нацюрмортаў.

Літ.: Шнып а р к о ў А.М. І.Н.Стасевіч. Мн., 1985.

СТАСЕ́ВІЧ Лілія Яфрэмаўна (22.10.1921, г. Калуга, Расія — 9.6.1999), бел. актрыса, дыктар радыё. Засл. арт. Беларусі (1965). Скончыла Рэсп. тэатр. вучылішча ў Мінску (1941). З 1944 актрыса Бел. т-ра імя Я.Купалы. У 1948—80 дыктар на Бел. радыё, выкладала ў Бел. тэатр.-маст. ін-це (1956—63, 1971—75). Вяла грамадска-паліт., літ.-драм., муз. і інш. перадачы, святочныя рэпартажы. Выступала як чытальнік, у рэпертуары пераважалі творы бел. пісьменнікаў.

СТАСЕ́ВІЧЫ, Адам, Валенты і Марцін, бел. дойліды 1-й пал. 17 ст. Жылі ў в. Дайліды Іўеўскага р-на Гродзенскай вобл. Удзельнічалі ў буд-ве Іўеўскай сядзібы і інш. пабудоў Іўеўшчыны.

СТА́СЕЎКА, вёска ў Вішнёўскім с/с Бабруйскага р-на Магілёўскай вобл., на правым беразе р. Бярэзіна. Цэнтр калгаса. За 30 км на Пд ад г. Бабруйск, 140 км ад Магілёва, 25 км ад чыг. ст. Бярэзіна. 387 ж., 179 двароў (2001). Сярэдняя школа-сад, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан.

СТАСУ́НАК у матэматыцы, тое, што *адносіны*.

СТАСЮ́НАС (Stasiūnas) Іонас (26.9.1919, в. Нічунай Панявежскага пав., Літва — 3.8.1987), літоўскі спявак (барытон). Нар. арт. СССР (1964). Скончыў Каўнаскую кансерваторыю (1948). З 1941 саліст Каўнаскага вял. т-ра, з 1944 у Т-ры оперы і балета Літвы. З 1962 выкладаў у Літ. кансерваторыі (з 1983 праф.). С. вылучалі высокая муз. культура, прыгожы сакавіты голас, дар сцэн. пераўвасаблення. Сярод партый: Сакалас («Мары-

тэ» А.Рачунаса), Палкоўнік, Чорны пан («Дачка», «Ave vita» В.Кловы), Радвіла («Даля» Б.Дварыёнаса), Барыс («Барыс Гадуноў» М.Мусаргскага), Ігар («Князь Ігар» А.Барадзіна), Мазепа, Томскі, Ялецкі («Мазепа», «Пікавая дама» П.Чайкоўскага), Лістрат («У буру» Ц.Хрэннікава) і інш. Дзярж. прэмія СССР 1951.



І.Стасюнас.

СТА́ТАК, група дзікіх млекакормячых аднаго віду з узаемазвязанымі паводзінамі, якія захоўваюць блізкасць адзін да аднаго і маюць аднолькавы рытм актыўнасці і напрамак руху. Утварэнне С. характэрна для кітападобных, капытных, прыматаў, сумчатых, некат. драпежных. Склад С. (паводле ўзросту і полу) і памеры непастаянныя (у адрозненне ад сям'і, гарэма). Макс. памеры вызначаюцца магчымасцямі ўзаемнай каардынацыі паводзін, у кітоў і прыматаў — некалькі дзесяткаў асобін, у капытных (паўн. алені, сайгакі, гну) — сотні і тысячы. Найб. буйныя С. ўтвараюцца ў час сезонных міграцый. У С. перайманне пераважае над свабодным прыняццем рашэння, што характэрна для адзіночных жывёл. Складаныя іерархія і сістэма сувязей паміж асобінамі ў С. прыматаў. У капытных іерархія вызначаецца памерамі цела, рагоў. Ужывёлагадоўлі С. — група с.-г. жывёл, сфарміраваная ў гаспадарцы для асобнага ўтрымання, адкорму і пасьбы. С. авечак — *атара*, С. коней — *табун*. У гадоўлі буйн. раг. жывёлы вылучаюць С. дойныя, нагульныя (гурт), цялят, маладняку.

СТА́ТАР (англ. stator які стаіць нерухома, ад лац. sto стаю), нерухомая частка *ротарных машын*. Канструкцыі С. — разнастайныя, залежаць ад віду машыны.

У эл. *пераменнага току машынах* С. звычайна складаецца з асяродка — магнітаправода з эл.-тэхн. сталі (магн. поле яго абмоткі ўзаемадзейнічае з магн. полем абмоткі *ротара*) і *станіны*. С. *пастаяннага току машыны* складаецца з ярма, замацаванага ў станіне, галоўных і дадатковых полюсаў, на якія накладзены абмоткі. У гідратурбінах С. — стальная кальцавая дэталь, якая служыць нясучай канструкцыяй (фундаментнай часткай) турбіны. С ёсць і ў іншых машынах (напр., вентылятарах, *лінейных электрарухавіках*, у якіх асяродак С. разгорнуты ў лінію).

СТАТКЕ́ВІЧЫ, Сцяцкевічы, Сцяцковічы, Стацкевічы, Стацковічы, шляхецкі род герба «Касцеша» ў ВКЛ. Родапачынальнік — Сцецка Пятровіч, гаспадарскі дваранін, войт магілёўскі і слуцкі (15 ст.). Меў сына Ждана, які валодаў Любанічамі, Чаркасавам і Расасною, унукаў Хаму, Яўмена і Андрэя, ротмістра і дваранін вял. князя ВКЛ Казіміра. Найб. вядомыя:

Іван Андрэевіч (?—1554), сын Андрэя Ждановіча, падскарбі надворны ВКЛ. Багдан Іванавіч (? — да крас. 1586), сын Івана Андрэевіча, староста кокенгаўзенскі, падчашы ВКЛ у 1558—72, маршалак гаспадарскі з 1572, маршалак браслаўскі. Атрымаў ад вял. князя маёнтак Заверцы ў Ашмянскім пав., адсюль прадстаўнікі роду ўжывалі прозвішча Статкевіч-Заверскі. Вільгельм (?—1616), сын Багдана Іванавіча, падкаморы браслаўскі ў 1613. Крыштоф (? — да 1652), сын Вільгельма, ротмістр, староста азарышчанскі, падкаморы браслаўскі. Вызначыўся ў *вайну Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—67* абаронай Азарышчанскага замка ў 1654. Багдан (?—1651), сын Вільгельма, падкаморы мсціслаўскі ў 1630—44, кашталян мсціслаўскі ў 1644—46 і новагародскі з 1646. Актыўна выступаў у абарону праваслаўя. Разам з жонкай Аленай Багданаўнай Саламярэцкай заснаваў Баркалабаўскі Узнясенскі жаночы манастыр, *Буйніцкі Святадухаўскі манастыр, Аршанскі Куцеінскі Богаяўленскі манастыр, Аршанскі Куцеінскі Успенскі манастыр*, фінансаваў дзейнасць *Куцеінскай друкарні*. Ян (1601—34), сын Вільгельма, харунжы ашмянскі. Удзельнічаў у бітвах пад Хашнам (1621) і Смаленскам (1633—34). Ян (?—1660), сын Яна, каралеўскі дваранін, кашталян новагародскі з 1652.

У.М.Вяроўкін-Шэлюта.

СТАТО́НІМ (ад англ. state дзяржава), назва дзяржавы або аўт.-тэр. ўтварэння, якая часцей за ўсё этымалагічна звязана з назвай народа, што яго насяляе, яго *этноніма*. Напр., Францыя — краіна французаў, Тува (Тыва) — аўтаномія для тувінцаў і да т.п. Часам назіраецца разыходжанне паміж С. і этнонімам. Напр., Бельгія, населеная фламандцамі і валонамі, назва ад кельцкага племя бельгаў; у С. «Гана» адноўлена назва сярэдневяковай афр. дзяржавы, хоць тэрытарыяльна яны не супадаюць. На розных мовах С. адной і той жа дзяржавы можа гучаць інакш, чым на роднай мове. Напр., Германію яе суседзі называюць Джэрмані (англ.), Алемань (франц.), Нямеччына (некаторыя славянскія краіны), Вацыя (прыбалт. народы), Тэдэска (італьянцы).

СТАТС-САКРАТА́Р (ням. Staatssecretär, англ. Secretary of State, франц. Secrétaire d'État дзярж. сакратар), 1) у Расіі 18—19 ст. асабісты сакратар (дакладчык) імператара; таксама ганаровае прыдворнае званне вышэйшых саноўнікаў з правам асабістага даклада імператару і абвяшчэння яго вусных указанняў. С.-с. Дзярж. савета — нач. яго аддзялення Дзярж. канцылярыі. 2) У Герм. імперыі 1871—1918 — імперскі міністр з непасрэдным падпарадкаваннем рэйхсканцлеру. 3) У сучаснай Германіі і некат. інш. краінах (у т.л. ў Рэспубліцы Беларусь) — вышэйшая службовая асоба ў апараце міністэрства, бліжэйшы пам. міністра. 4) У некаторых краінах афіц. тытул некат. міністраў (у Вялікабрытаніі, ЗША) або кіраўнікоў ведамстваў пры прэм'ер-міністру (у Францыі).

СТА́ТУС (лац. status становішча, стан) прававы, устаноўленае нормамі права становішча грамадзяніна ці юрыдычнай асобы, сукупнасць іх правоў і абавязкаў.

СТА́ТУС САЦЫЯ́ЛЬНЫ, суадноснае становішча (пазіцыя) індывіда або групы ў сац. сістэме, якое вызначаецца па шэрагу эканам., прафес., этн. і інш. спецыфічных для дадзенай сістэмы адзнак (пол, узрост, прафесія, адукацыя, даход і інш.). Упершыню панятце «С.с.» выкарыстаў у канцы 19 ст. англ. гісторык Г.Мэн. К.*Маркс* і Ф.*Энгельс* лічылі, што аб'ектыўнай асновай становішча індывідаў у грамадстве з'яўляецца грамадская практыка, іх сумесная дзейнасць, якая набывае ў ходзе развіцця асаблівыя гіст. формы. М.*Вебер* сцвярджаў, што стратыфікацыя грамадства і становішча індывіда ў ім вызначаюцца не толькі эканам. кампанентамі (доступ да сродкаў вытв-сці, грамадскіх багацяў), але і сац. ролямі і пазіцыямі. Кожны індывід мае некалькі статусных характарыстык. Вылучаецца гал. *статус*, які і вызначае становішча асобы ў грамадстве. У залежнасці ад таго, якую пазіцыю займае чалавек у грамадстве дзякуючы спадчынным адзнакам (сац. паходжанне, раса, нацыянальнасць і інш.) або асабістым намаганням (адукацыя, кваліфікацыя і г.д.), адрозніваюць прыродны і дасягальны С.с. Суадносіны іх у сац. структуры грамадства з'яўляюцца паказчыкамі характару эканам. і паліт. улады, якая і вызначае адпаведную структуру С.с. *І.В.Катляроў.*

СТА́ТУС-КВО (лац. status quo), у міжнародным праве становішча ў якой-н. галіне міжнар. адносін або ва ўзаемаадносінах дзяржаў, якое існавала нейкі час у мінулым або існуе ў дадзены момант. Падтрымліваць С.-к. або аднавіць С.-к. — значыць захаваць існуючае становішча або вярнуцца да таго, што існавала раней. С.-к. антэ белум — становішча, якое існавала да пачатку вайны.

СТАТУ́Т (позналац. statutum ад лац. statuo пастанаўляю, вырашаю), 1) збор законаў у некат. краінах Еўропы 14—18 ст. Напр., *Статут Вялікага княства Літоўскага 1588*. 2) Звод нарматыўна-прававых правіл, дакументаў, якія вызначаюць структуру, парадак дзейнасці і паўнамоцтвы якога-н. сац. ін-та, арг-цыі, установы. Напр., С., якія рэгламентуюць парадак і асновы дзейнасці Узбр. Сіл (гл. *Статуты воінскія*), міжнар. арг-цый (статут ААН і інш.). 3) Палажэнне пра што-небудзь. Напр., у С. ордэна — яго апісанне, парадак узнагароды і нашэння. 4) Назва заканадаўчых актаў агульнанарматыўнага характару ў Вялікабрытаніі, ЗША і інш. краінах (напр., статутнае права).

СТАТУ́Т прадпрыемства, дакумент, які вызначае задачы, правілы і кола дзейнасці прадпрыемства, яго становішча ў сістэме гасп. органаў. Зацвярджаецца органам, які прыняў рашэнне пра стварэнне прадпрыемства. Змяшчае: найменне (нумар) прадпрыемства і яго паштовы адрас; найменне вышэйстаячага органа; прадмет і мэту дзейнасці; указанне пра тое, што прадпрыемства мае *статутны фонд* і з'яўляецца *юрыдычнай асобай*; найменне службовай асобы (дырэктар, начальнік, упраўляючы), якая яго ўзначальвае. У С. могуць быць уключаны і інш. палажэнні, звязаныя з асаблівасцямі дзейнасці прадпрыемства, калі яны не супярэчаць дзеючаму заканадаўству.

СТАТУ́Т ААН, шматбаковае міжнар. пагадненне, распрацаванае вядучымі дзяржавамі антыгітлераўскай кааліцыі (СССР, ЗША, Вялікабрытаніяй, Францыяй і Кітаем) у гады 2-й сусв. вайны і канчаткова ўзгодненае на канферэнцыі ў Сан-Францыска ў 1945. Падпісаны 51 дзяржавай (у т.л. БССР) і набыў сілу 24.10.1945. З'яўляецца канстытуцыйным дакументам, які ўстанавіў і рэгулюе жыццядзейнасць найбуйнейшай універсальнай міжнар. арг-цыі — *Арганізацыі Аб'яднаных Нацый*, асн. мэта якой, як сцвярджаецца ў прэамбуле Статута, заключаецца ў тым, каб «пазбавіць будучыя пакаленні ад бедстваў вайны, двойчы ў нашым жыцці прынёсшай чалавецтву невыказнае гора». Прадугледжвае, што ААН павінна быць цэнтрам для ўзгаднення дзеянняў дзяржаў у дасягненні мэт падтрымання міжнар. міру і бяспекі, развіцця дружалюбных адносін і ажыццяўлення ўсебаковага супрацоўніцтва дзяржаў з розным сац. ладам.

Статут заклаў падмурак універсальнай сістэмы *калектыўнай бяспекі*, цэнтр. структурным звяном якой з'яўляецца *Савет Бяспекі ААН*, які нясе гал. адказнасць за падтрыманне міжнар. міру і бяспекі. Статут вызначае функцыі і паўнамоцтвы інш. гал. органаў ААН — *Генеральнай Асамблеі ААН, Эканамічнага і сацыяльнага Савета ААН, Савета па апецы ААН, Міжнароднага суда ААН, Сакратарыята ААН*, а таксама *спецыялізаваных устаноў ААН*. Ён устанаўляе ў абавязваючай форме асн. прынцыпы і нормы паводзін дзяржаў на сусв. арэне і падкрэслівае, што дзяржавы павінны строга выконваць прынцыпы забароны выкарыстання сілы і пагрозы сілай, мірнага вырашэння міжнар. спрэчак, неўмяшання ва ўнутр. справы, суверэннай роўнасці дзяржаў, добрасумленнага выканання міжнар. абавязацельстваў і інш. На падставе С. ААН узнікла, працягвае дзейнічаць і развіваецца шырокая і разгалінаваная сістэма пасляваенных міжнар. дагавораў і пагадненняў у самых розных галінах чалавечай дзейнасці.

«СТАТУ́Т АБ КІРАЎНІ́ЦТВЕ ІНШАРО́ДЦАЎ» 1822, заканадаўчы акт Расійскай імперыі, які разам са «Статутам аб сібірскіх кіргізах» вызначаў сістэму кіравання нярус. народамі Сібіры. Складзены пры ўдзеле М.М.*Спяранскага*. Падзяляў нярус. народы Сібіры («іншародцаў») на аселых, качавых і вандроўных. «Аселыя іншародцы» (гал. чынам сіб. татары) у прававых адносінах прыраўноўваліся да рус. цяглых саслоўяў — мяшчан і дзярж. сялян. Кіраванне «вандроўнымі іншародцамі» (ненцы, юкагіры і інш. паляўнічыя народы Паўн. Сібіры) ажыццяўлялі прадстаўнікі родаплем. вярхоў — «князцы» і старасты. У «качавых іншародцаў» (бураты, якуты, эвенкі, хакасы і інш.) кожны улус або стойбішча атрымлівалі родавае праўленне, якое складалася са старасты і 1—2 памочнікаў. Некалькі ўлусаў і стойбішчаў падпарадкоўваліся «іншароднай управе». Статут замацоўваў за качавымі народамі землі, якімі тыя карысталіся, дазваляў гандаль, вызначаў памер і спосабы збірання *ясаку*, пашыраў на гэтыя народы крымін. заканадаўства краіны. Створаныя ў адпаведнасці са статутам родавыя праўленні і «іншародныя ўправы» існавалі да пач. 20 ст.

СТАТУ́Т ВЯЛІ́КАГА КНЯ́СТВА ЛІТО́ЎСКАГА 1529, Першы статут Вялікага княства Літоўскага, звод законаў феад. права, які дзейнічаў у ВКЛ у сярэдзіне 16 ст. Помнік старабел. пісьменства. Падрыхтаваны на аснове кадыфікацыі і сістэматызацыі норм мясц. звычаёвага права, пастаноў дзярж. і суд. устаноў, *Судзебніка 1468*, прывілеяў. Статут склала камісія пад кантролем канцлера ВКЛ А.Гаштольда (ёсць меркаванні, што ў яго складанні і рэдагаванні прымаў удзел Ф.Скарына). Пры распрацоўцы Статута ўпершыню вырашаны шэраг складаных тэарэт. і практычных задач: выпрацавана сістэма і структура размяшчэння прававых норм у залежнасці ад іх зместу, уключаны тыпавыя і абагульненыя нормы; дадзена дакладная рэдакцыя кожнага артыкула; уведзена шмат новых прававых норм, у якіх адлюстраваны тагачасныя таварна-грашовыя адносіны; уключаны нормы дзярж., адм., грамадз., сямейнага, крымін., судова-працэсуальнага і інш. галін права. Складальнікі Статута не прытрымліваліся сістэмы кадыфікацыі, прынятай у рымскім праве, а выпрацавалі сваю. У яе аснову пакладзены новыя прынцыпы: суверэннасць дзяржавы (насуперак сярэдневяковаму касмапалітызму), адзінства права, прыярытэт пісанага права. Статут уключаў нормы агульнага права і спец. нормы, якія забяспечвалі прывілеі пануючаму класу або яго групам.

Статут уведзены ў дзеянне 29.9.1529. Складаецца з 13 раздзелаў і 244 артыкулаў (пазнейшыя дапаўненні павялічылі іх да 283). У 1—3-м раздзелах змешчаны ў асн. нормы дзярж. права і прынцыповыя палажэнні інш. галін права, у 4-м і 5-м — шлюбна-сямейнае, апякунскае і спадчыннае, у 6-м — судова-працэсуальнае, у 7-м — крымін., у 8-м — зямельнае, у 9-м — лясное і паляўнічае, у 10-м — цывільнае, у 11—13-м — крымін. і крымін.-працэсуальнае права. У Статуце юрыдычна замацаваны асновы грамадскага і дзярж. ладу, прававое становішча класаў, саслоўяў і сац. груп насельніцтва, парадак утварэння, склад і паўнамоцтвы некаторых органаў дзярж. кіравання і суда. Абвяшчалася правіла, паводле якога ўсе асобы, «як убогія, так і багатыя», павінны судзіцца паводле норм, выкладзеных у Статуце. Вял. князь абавязваўся захоўваць тэр. цэласнасць дзяржавы, не дапускаць чужаземцаў на дзярж. пасады ВКЛ, не даваць ім маёнткаў, не адбіраць у мясц. феадалаў пасады і маёмасці без суда, прытрымлівацца ўсіх старых законаў і звычаяў. Абвяшчаўся прынцып публічнасці правасуддзя, фармальнай роўнасці бакоў у працэсе, права абвінавачанага на абарону з удзелам адваката. Адначасова ў Статуце абвяшчалася захаванне прывілеяў і льгот для феадалаў. Ідэі гуманізму паўплывалі на нормы крымін. і цывільнага права, выкладзеныя ў Статуце 1529 і наступных Статутах. Так, у Статуце 1529 (раздз. 1, арт. 7) абвяшчалася, што ніхто не павінен адказваць за чужую віну, а крымін. пакаранне трэба назначаць толькі асобам, віна якіх устаноўлена судом. У арт. 27-м раздз. 7-га прадугледжаны тэрмін крымін. праследавання: за найб. цяжкае злачынства — 10 гадоў, менш цяжкае — 3 гады. У 7-м арт. 11-га раздзела зроблена спроба абмежаваць халопства. Вольны чалавек за здзейсненае злачынства не павінен аддавацца ў вечную няволю. Даволі поўна выкладзены нормы, якія забяспечвалі права ўласнасці феадалаў. Змяшчаліся нормы, якія вызначалі маёмасныя правы жанчын і дзяцей, парадак выдачы дзяўчат замуж. Абвяшчалася абяцанне вял. князя не выдаваць дзяўчат замуж прымусова, а толькі з іх згоды. Падрабязна рэгламентаваўся парадак назначэння апекуноў непаўналетнім дзецям, якія засталіся без бацькоў. Нормы дзярж. права, выкладзеныя ў Статуце, у сваёй сукупнасці ўяўлялі своеасаблівую феад. канстытуцыю, у якой упершыню вызначалася структура і характар дзейнасці органаў дзярж. улады, замацоўваліся асн. правы і прывілеі пануючага класа і саслоўя шляхты. Статут 1529 адыграў значную ролю ў далейшай кадыфікацыі і сістэматызацыі права. Як і *Статут Вялікага княства Літоўскага 1566*, паслужыў базай і крыніцай для распрацоўкі *Статута Вялікага княства Літоўскага 1588*.

Статут напісаны на бел. мове, мае важнае значэнне як помнік прававой культуры і мовы бел. народа, дае магчымасць вывучаць лексіку і стыль, дзярж.-прававую тэрміналогію таго часу. Вядомы пераклады Статута 1529 на лац. (1530) і польск. (1532) мовы. Захаваліся 4 спісы на бел. мове: Фірлееўскі, Замойскіх, Дзялынскіх, Слуцкі; 2 спісы на лац. мове: Лаўрэнцьеўскі, або Пфор-

цкі, Пулаўскіх; спіс на польск. мове — Альшэўскі (Свідзінскі і Вастрабрамскі спісы загінулі ў 1944). Упершыню Статут 1529 надрукаваны ў 1841 у Познані ў «*Зборы літоўскіх законаў з 1389 да 1529*» (лацінскім шрыфтам), у 1854 — кірыліцай у Маскве.

Публ.: Старый Литовский Статут 1529 г. // Временник Московского о-ва истории и древностей российских. М., 1854. Кн. 18; Статут Великого княжества Литовского 1529 г. Мн., 1960.

Літ.: Пичета В.И. Литовский Статут 1529 г. и его источники // Пичета В.И. Белоруссия и Литва, XV—XVI вв. М., 1961; Крапивин П.Ф., Чернецкая Ю.И. О рукописях и изданиях первого Литовского Статута // Славянский архив. М, 1959; Первый Литовский Статут 1529 г.: Материалы респ. науч. конф. Вильнюс, 1982; Лазутка С., Гудавичюс Э. Первый Литовский Статут. [Т.] 1, ч. 1—2. Вильнюс, 1983—85; Юхо І. Крыніцы беларуска-літоўскага права. Мн., 1991; Улашчык М. Першы Літоўскі Статут: (З гісторыі знаходак рукапісаў і іх вывучэння) // Бел. гіст. агляд. 1996. Сш. 1.

І.А.Юхо.

СТАТУ́Т ВЯЛІ́КАГА КНЯ́СТВА ЛІТО́ЎСКАГА 1566, Другі статут Вялікага княства Літоўскага, звод законаў феад. права, які дзейнічаў у Беларусі і Літве ў 1566—88, а на Правабярэжнай Украіне і ў 17—18 ст; помнік старабел. пісьменства.

Асн. крыніцы Статута 1566: агульназемскія і абласныя прывілеі, *Судзебнік 1468*, *Статут Вялікага княства Літоўскага 1529* і некат. нормы звычаёвага права; выкарыстаны таксама нормы царк. (рымска-каталіцкага і грэка-правасл.) права. У ім спалучаны тэарэт. распрацоўкі мясц. права з практычнай дзейнасцю і тэарэт. асновамі рымскага і зах.-еўрап. права. З тэксту *Бельскага прывілея* 1564 вынікае, што праект Статута рыхтавала камісія, працай якой кіраваў канцлер М.*Радзівіл* Чорны; у ёй удзельнічаў маршалак дворны А.Б.*Валовіч*, верагодна, П.*Раізій*, А.*Ратундус* і інш. Праект Статута 1566 аддадзены сойму на папярэдні разгляд у 1561, зацверджаны 1.7.1564, меркавалася ўвесці яго ў дзеянне з 11.11.1564. Аднак з-за спрэчак па асобных артыкулах Статут набыў законную сілу з 1.3.1566; некаторыя змены ўнесены ў яго прывілеем 1.7.1566. У Статут былі ўпісаны *Віленскі прывілей 1563*, Бельскі прывілей 1564, Віленскі прывілей 1565. У Статуце 1566 захавана з невял. зменамі структура Статута 1529. У ім 14 раздзелаў і 367 артыкулаў. 1—3 раздзелы ахопліваюць нормы дзярж., ваеннага, адм. права, 4-ы — судовы лад і судовы працэс, 5—6-ы — сямейнае і апякунскае права, 7—9-ы — цывільнае, 10-ы — ляснае і паляўнічае, 11—14-ы — крымін. права. Найб. істотныя змены ўнесены ў нормы дзярж., судова-працэсуальнага і цывільнага права. Статут 1566 замацаваў асн. прынцыпы права: адзінства права для жыхароў краіны, хоць яно не было роўным для ўсіх, дзярж. суверэнітэт, абмежаванне ўлады вял. князя, прыярытэт пісанага права. Упершыню пазначалася аддзяленне суда ад органаў улады і кіравання. Для гэтага ствараліся *земскія суды* і *падкаморскія суды*.

Больш поўна рэгламентавалася кампетэнцыя органаў дзярж. улады і кіравання. Кіраўніком дзяржавы і гал. асобай ва ўсёй сістэме дзярж. органаў прызнаваўся вял. князь, які ў Статуце называецца гаспадаром. Паўнамоцтвы вял. князя грунтаваліся на выбарным пачатку і рэгламентаваліся прававымі нормамі Статута 1566. Вял. князь не меў права без ра'шэння сойма пачынаць вайну, устанаўліваць падаткі на ваен. патрэбы (раздз. 2, арт. 2), выдаваць законы (раздз. 3, арт. 12). Вял. князь абавязваўся «всих князей и панов-рад, як духовных, так и свецких, и всех врядников земских и дворных, панов хоругвных, шляхту, рыцарство, мещане и всих людей посполитых у Великом князстве Литовском... захоавати при свободах и вольностях» (раздз. 3, арт. 2). Важнае значэнне меў артыкул, які забараняў даваць маёнткі, пасады, чыны і званні чужаземцам, у т.л. ўраджэнцам Польшчы (раздз. 3, арт. 9). Статут 1566 заканадаўча замацаваў прывілеі і гал. ролю буйных феадалаў у дзяржаве, даваў усім феадалам права вольна распараджацца сваімі маёнткамі. У ім паўней, чым у статуце 1529, выкладзены і нормы спадчыннага права (8-ы раздзел). Істотныя змены ўнесены ў крымін. права. Суб'ектам злачынства прызнаваўся толькі чалавек. Непаўналетнія маглі быць пакараны толькі пасля 14 гадоў (раздз. 14, арт. 8). Абвяшчалася *прэзумпцыя невінаватасці* (раздз. 14, арт. 2). Крымін. пакаранне павінна было ажыццяўляцца толькі па суду, а асоба, якая абвінаваціла каго-н. у злачынстве і не даказала яго віны, павінна была быць пакарана так, як мог быць пакараны абвінавачаны ёю (раздз. 1, арт. 2).

Статут напісаны на бел. мове, быў перакладзены на лац. і польск. мовы. Выяўлена 58 спісаў Статута 1566, з іх 13 на бел., 40 на польск. і 5 на лац. мовах. Упершыню надрукаваны ў 1855 у Маскве.

Публ.: Статут Великого княжества Литовского 1566 г. [и поправы статутовые 1578 г.] // Временник Московского о-ва истории и древностей российских. М., 1855. Кн. 23.

Літ.: Подозерская Г.Ф. Второй Литовский Статут: [К истории его составления] // Ист. зап. 1945. №17; Пичета В.И. Земельное право в статутах 1529 и 1566 г. // Пичета В.И. Белоруссия и Литва, XV—XVI вв. М., 1961; Юхо І. Крыніцы беларуска-літоўскага права. Мн., 1991.

І.А.Юхо.

СТАТУ́Т ВЯЛІ́КАГА КНЯ́СТВА ЛІТО́ЎСКАГА 1588, Трэці статут Вялікага княства Літоўскага, звод законаў феад. права, які дзейнічаў у ВКЛ з 1589, а пасля далучэння Беларусі да Рас. імперыі — у Віцебскай і Магілёўскай губ. да 1831, у Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губ. да 1840. Помнік старабел. пісьменства.

Пасля таго як быў прыняты *Статут Вялікага княства Літоўскага 1566*, кадыфікацыйная работа не спынілася. Ужо на Брэсцкім сойме 1566 было папраўлена некалькі артыкулаў. Праз 2 гады Гродзенскі сойм унёс папраўкі ў некат. артыкулы і стварыў камісію для дапрацоўкі Статута. Камісія для выпраўлення Статута 1566 была выбрана і на Люблінскім сойме 1569. Крыніцы для распрацоўкі Статута 1588 — *Статут Вялікага княства Літоўскага 1529*, Статут ВКЛ 1566, соймавыя пастановы 1573, 1578, 1580 і 1584, прывілеі, пастановы павятовых соймікаў. Да канца 1584 работа над Статутам была завершана, але ў сувязі з тым, што ён ігнараваў акт *Люблінскай уніі 1569*, прадстаўнікі Польшчы не дапускалі яго зацвярджэння на агульным сойме Рэчы Паспалітай. Каб захаваць велікакняжацкі трон, Жыгімонт III Ваза зацвердзіў Статут сваім прывілеем 28.1.1588.

Статут 1588 падрыхтаваны кваліфікаванымі праваznаўцамі пад кіраўніцтвам канцлера ВКЛ А.Б.*Валовіча* і падканцлера Л.І.*Сапегі*. У Статут увайшлі нормы дзярж. (канстытуцыйнага) права, чаго на той час не было ў заканад. практыцы інш. еўрап. дзяржаў. Ён абагульніў тагачасныя дзярж.-прававыя ідэі, некаторыя з іх апярэджвалі свой час. У Статуце знайшла адлюстраванне тэорыя падзелу ўлад на заканадаўчую (сойм), выканаўчую (вял. князь, адм. апарат) і судовую (*Трыбунал Вялікага княства Літоўскага*, земскія і падкаморскія суды, выбарныя і незалежныя ад адміністрацыі). Статут 1588 мае 14 раздзелаў і 488 артыкулаў. У 1—4-м раздзелах змешчаны нормы дзярж. права і судовага ладу, у 5—10-м і часткова ў 13-м — шлюбна-сямейнага, зямельнага і цывільнага права, у 11—12, 14-м і часткова ў 13-м — крымін. і крымін.-працэсуальнага права. Ідэі *Рэфармацыі* і верацярпімасці замацаваны ў артыкулах 3-га раздзела, паводле якога вял. князю і ўсім дзярж. органам прадпісана забяспечваць спакой усіх жыхароў дзяржавы, незалежна ад таго, якога вучэння яны прытрымліваюцца ў хрысц. веравызнанні. Ідэі гуманізму адбіліся на нормах крымін. і цывільнага права. Так, у пэўнай ступені гарантаваліся маёмасныя і асабістыя правы мяшчан. Кожны вольны чалавек мог пры жаданні выехаць за мяжу, калі гэта рабілася не на шкоду сваёй краіне. Статут юрыдычна замацоўваў тыя фактычныя адносіны, якія склаліся паміж ВКЛ і Польшчай пасля 1569, але абавязаў урад вярнуць адлучаныя ад княства землі, забараняў назначаць на дзярж. пасады і надзяляць зямлёй «чужаземцаў і загранічнікаў», у т.л. і падданых Польшчы, захаваў адасобленасць дзярж. устаноў, арміі, заканадаўства, эканомікі і фінансаў ВКЛ. Уладаром дзяржавы прызнаваўся вял. князь, названы ў Статуце гаспадаром. Але многія яго паўнамоцтвы былі абмежаваны і выконваць іх ён мог толькі са згоды *сойма*, вышэйшых дзярж. службовых асоб. Статут замацоўваў феад. грамадскі лад, наяўнасць 2 асн. класаў: феадалаў і феадальна-залежных сялян. Асабліва былі вылучаны князі, паны радныя і паны харугоўныя, якія мелі права судзіць не толькі простых людзей, але і залежную ад іх шляхту, даваць ёй у часовае карыстанне землі, маёнткі, а таксама адбіраць гэтыя маёнткі, нягледзячы на даўнасць уладання імі (раздз. 3, арт. 30). Статут рэгламентаваў таксама некат. правы і абавязкі простых людзей і прадстаўнікоў этн. груп (сялян, слуг, чэлядзі, мяшчан, рамеснікаў, яўрэяў, татараў). Ён абараняў інтарэсы буйных і сярэдніх феадалаў і ўзмацняў іх прывілеяванае становішча, канчаткова запрыгоніў сялян. Для шляхты Статут прадугледжваў крымін. адказнасць за забойства простага чалавека, забараняў перадачу ў няволю вольнага чалавека за даўгі або злачынства, абмяжоўваў пакаранне непаўналетніх да 16 гадоў. Хоць Статут дэкларава'ў, што ўсе простыя людзі разам з феадаламі ўдзельнічаюць у выбранні гаспадара (раздз. 3, арт. 2), аднак простых людзей не дапускалі ў сойм, а іх удзел у паліт. жыцці абмяжоўваўся

выключна мясц. валаснымі справамі. Статут 1588 закончыў кадыфікацыю права ў ВКЛ. Ён з'яўляецца выдатным помнікам бел. мовы і юрыд. думкі феад. эпохі.

Статут ВКЛ 1588 выкарыстоўваўся пры кадыфікацыі ў канцы 16 ст. пруского права, складанні *Саборнага ўлажэння 1649* у Расіі, афіцыйна не зацверджаных укр. зб-каў «Права, за якими судится малороссийский народ» (2-я чвэрць 18 ст.), «Суд и розправка в правах малороссийских» (1750—58). У заканадаўстве і судах Польшчы, Латвіі, Эстоніі ён ужываўся як дадатковая крыніца права. Статут 1588, пераважна ў рэдакцыі 1614, быў гал. пісьмовым зводам дзеючага права на Украіне (у Кіеўскай, Падольскай і Валынскай губ. дзейнічаў да 1840). У 17—19 ст. ён перакладзены на рус., укр. ням., франц., лац. мовы.

Статут упершыню надрукаваны на бел. мове ў 1588 у віленскай друкарні Мамоніча ў пад наглядам падканцлера Сапегі. Выданне яго двойчы паўторана (каля 1592—93 і каля 1600) з выхадной датай «1588». У 1614, 1619 і каля 1623 (з датай «1619») Л.Мамоніч выдаў Статут на польск. мове. У 1648 Статут на польск. мове надрукаваў у Варшаве каралеўскі друкар П.Элерт. Наступныя польскамоўныя выданні выйшлі ў Акадэмічнай друкарні ў Вільні ў 1693, 1744, 1786 і ў друкарні А.Марціноўскага ў 1819. У 1811 Статут у перакладзе на польскую і рус. мову выдадзены ў С.-Пецярбургу, у 1854 — у Маскве на бел. мове.

Роля ўсіх Статутаў у гісторыі бел. мовы надзвычай вялікая. Яны замацоўвалі лепшыя моўныя здабыткі канцылярска-юрыдычнага пісьменства свайго часу, былі ўзорам для шматлікіх пісараў, якія афармлялі дэкрэты соймаў і Галоўнага трыбунала ВКЛ, акты судоў, рэестры і інвентары маёнткаў, запаветы, тэстаменты, дыпламат. дакументы. Багаццем лексічнага матэрыялу са Статутамі не можа параўнацца ніводны іншы помнік старабел. пісьменства. У гэтых адносінах асабліва вылучаецца С. 1588 — самы вялікі кодэкс. Дзякуючы гэтаму Статуты маюць першаступеннае значэнне для вывучэння гісторыі бел. мовы, асабліва яе лексікі. Значэнне Статутаў у гісторыі бел. мовы яшчэ і ў тым, што яны юрыдычна замацоўвалі прававое становішча бел. мовы як дзяржаўнай у ВКЛ.

Публ.: Статут Великого княжества Литовского 1588 г. [печатанный с мамоничевского издания] // Временник Московского о-ва истории и древностей российских. М., 1854. Кн. 19; Статут Вялікага княства Літоўскага 1588: Тэксты. Давед. Камент. Мн., 1989.

Літ.: Пташицкий С.Л. К вопросу об изданиях и комментариях Литовского статута: Ист.-библиогр. справка. СПб., 1893; Яго ж. К истории литовского права после третьего статута. СПб., 1893; Бершадский С.А. Литовский статут и польские конституции: Ист.-юрид. исслед. СПб., 1893; Лаппо И.И. Литовский Статут 1588 г. Т. 1—2. Каунас, 1934—38; Юхо Я. Статуты Вялікага княства Літоўскага // Полымя. 1966. №11; Бардах Ю. Литовские статуты — памятники права периода Возрождения // Культурные связи народов Восточной Европы в XVI в. М., 1976; Яго ж. К вопросу об утверждении Литовского статута 1588 г. // Славяне в эпоху феодализма. М., 1978; Яго ж. Statuty litewskie a prawo rzymskie. Warszawa, 1999; Лабынцев Ю.А. «Статут Великого княжества Литовского» 1588 г. — памятник белорусской старопечатной литературы: (К 400-летию выхода в свет) // Сов. славяноведение. 1988. №5; Третий литовский Статут 1588 г.: Материалы респ. науч. конф. Вильнюс, 1989; Мякишев В. Возвращаясь к проблеме изданий Литовского Статута 1588 г. // Slavia Orientalis. 1997. №2.

І.А.Юхо.

«СТАТУ́Т ВЯЛІ́КАГА КНЯ́СТВА ЛІТО́ЎСКАГА 1588», комплекснае выданне, якое прысвечана выдатнаму помніку прававой культуры і юрыд. думкі феад. грамадства 16 ст. — *Статуту Вялікага княства Літоўскага 1588* з нагоды яго 400-годдзя і з'яўляецца першай на Беларусі яго поўнай публікацыяй. Падрыхтавана і выдадзена выд-вам «*Беларуская Энцыклапедыя*» ў 1989. Уключае: нарыс «Сацыяльна-гістарычныя ўмовы ўзнікнення Статута Вялікага княства Літоўскага 1588 г.», дзе раскрыты ўмовы, пры якіх адбывалася падрыхтоўка і ўвядзенне ў дзеянне Статута; арыгінальны тэкст Статута (факсімільнае ўзнаўленне), яго арыгінальны тэкст і пераклад на рус. мову; энцыклапедычны даведнік з 820 артыкулаў; паартыкульны каментарый; тэрміналагічны і імянны паказальнікі. Асн. частка матэрыялаў даведніка — артыкулы пра тагачасныя адм.-тэр. падзел ВКЛ, катэгорыі насельніцтва, саслоўі, службовыя асобы і пасады, судовы лад; віды злачынстваў і правапарушэнняў, меры пакарання і ўздзеяння за іх; грашовая сістэма, адзінкі вымярэння і інш. Змешчаны артыкулы пра крыніцы Статута і інш. прававыя акты і дакументы 15—16 ст., пра гісторыю падрыхтоўкі і выдання Статута, яго паліграфічныя і маст. асаблівасці. Шэраг артыкулаў прысвечаны выкарыстанню, зберажанню і гісторыі даследавання Статута. У каментарыях разглядаецца прававая сутнасць і гісторыя распрацоўкі кожнай з уключаных у яго норм.

Г.А.Маслыка.



«Статут Вялікага княства Літоўскага 1588». Мінск, 1989. Вокладка.

СТАТУ́Т ГАРНІЗО́ННАЙ І КАРАВУ́ЛЬНАЙ СЛУ́ЖБАЎ Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, афіцыйны нарматыўна-прававы дакумент, які вызначае прызначэнне і парадак нясення гарнізоннай і каравульнай службаў, правы і абавязкі службовых асоб, якія арганізоўваюць або нясуць гэтыя службы, а таксама парадак правядзення гарнізонных мерапрыемстваў з удзелам войск і інш. Статут зацверджаны Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (2001); уведзены ў дзеянне замест часовага статута, прынятага ў 1997.

С.М.Абрамаў.

СТАТУ́Т ДЫСЦЫПЛІНА́РНЫ (Дысцыплінарны статут) Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, нарматыўна-прававы дакумент, у якім вызначаны змест воінскай дысцыпліны, абавязкі і правываеннаслужачых па яе падтрыманні і ўмацаванні, віды заахвочвання, дысцыплінарных спагнанняў і парадак іх прымянення (накладання). Статут зацверджаны Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (2001); уведзены ў дзеянне замест часовага статута, прынятага ў 1997.

С.М.Абрамаў.

СТАТУ́Т СТРАЯВЫ́ (Страявы статут) Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, афіцыйны дакумент, які вызначае страявыя прыёмы, рух са зброяй і без яе; страі падраздзяленняў і часцей у пешым парадку і на машынах; парадак аддання воінскай чэсці, правядзення страявога агляду; становішча Баявога Сцяга воінскай часці ў страі, парадак яго вынасу і адносу да месца захоўвання; абавязкі ваеннаслужачых перад пастраеннем і ў страі, патрабаванні да іх страявога навучання, а таксама спосабы перамяшчэння ваеннаслужачых на полі бою і інш. С.с. ўведзены ў дзеянне (2001) загадам міністра абароны Рэспублікі Беларусь.

С.М.Абрамаў.

СТАТУ́Т УЛАДЗІ́МІРА МАНАМА́ХА 1113, законы вял. кіеўскага кн. *Уладзіміра Манамаха* [1113—25], змешчаныя ў пашыранай рэдакцыі *Рускай праўды*. Прыняты прадстаўнікамі вышэйшай феад. знаці ў с. Берастова каля Кіева пасля ўступлення Уладзіміра Манамаха на велікакняжацкі прастол. Статут складаецца з 69 артыкулаў, якія змяшчаюць нормы крымін., цывільнага і суд. права. Пад уплывам *Кіеўскага паўстання 1113* статут рабіў некат. ўступкі гар. нізам: вызначаліся крыніцы халопства (гл. *Халопы*), некалькі абмяжоўвалася ўлада гаспадара над *закупамі*, ліхварскі працэнт не мог перавышаць 25%

гадавых, забаранялася ператвараць у раба неплацежаздольнага купца-даўжніка, калі ён стаў такім з-за няшчаснага выпадку.

СТАТУ́Т УНУ́ТРАНАЙ СЛУ́ЖБЫ Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, нарматыўна-прававы дакумент, які вызначае агульныя абавязкі ваеннаслужачых і ўзаемаадносіны паміж імі, правілы ўнутр. парадку ў часцях і падраздзяленнях, абавязкі службовых асоб, салдат і матросаў, размеркаванне часу, паўсядзённы парадак, нарады на ўнутр. службу, развод сутачнага наряда і яго абавязкі, размяшчэнне вайсковых часцей і падраздзяленняў у населеных пунктах і інш. Статут зацверджаны Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (2001); уведзены ў дзеянне замест часовага статута, прынятага ў 1997.
С.М.Абрамаў.

СТАТУ́ТНЫ КАПІТА́Л, вызначаная статутам акц. т-ва сума зыходнага капіталу ў грашовым выражэнні, якая неабходна для пачатку дзейнасці гэтага т-ва. Утвараецца за кошт грошай, атрыманых ад продажу акцый, дзярж. сродкаў, прыватных капіталаў заснавальнікаў. Узнос у С.к. можа быць грашовы, маёмасны (зямля, збудаванні), у форме аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці (патэнты, ліцэнзіі, праекты). С.к. стварае матэрыяльна-рэчавую, грашовую, навук.-тэхн., інфарм. аснову дзейнасці акц. т-ва. Адлюстроўваецца ў пасіве балансу ў першапач. вартасці. С.к. называюць таксама дазволены, асноўны, зарэгістраваны, падпісны, намінальны.

СТАТУ́ТНЫ ФОНД, сукупнасць матэрыяльных і грашовых сродкаў, якія з'яўляюцца пастаянным укладам заснавальнікаў-удзельнікаў у створанае імі прадпрыемства (фірму, кампанію, т-ва); сумарная вартасць асн. і абаротных сродкаў, якія знаходзяцца ў карыстанні і распараджэнні прадпрыемства (фірмы, кампаніі, т-ва). Крыніцы павелічэння С.ф.: укараненне ў вытв-сць найноўшых дасягненняў навукі і тэхнікі, рэканструкцыя і абнаўленне асн. фондаў, павелічэнне аб'ёмаў вытв-сці і інш.; памяншаюць С.ф. знос і спісванне ўстарэлых машын і абсталявання, спажыванне і канфіскацыя часткі прыбытку і інш.

СТАТУ́ТЫ ВО́ІНСКІЯ, афіцыйныя нарматыўна-прававыя дакументы, якія рэгламентуюць паўсядзённую дзейнасць ваеннаслужачых ва ўзбр. сілах шэрагу дзяржаў, у т.л. Беларусі. С.в. вызначаюць дысцыплінарныя правы і абавязкі, жыццё і быт, нясенне службы і падрыхтоўку асабовага складу, а таксама асновы баявых дзеянняў падраздзяленняў, часцей і злучэнняў.

Спроба кадыфікаваць вайск. права на Беларусі зроблена пры складанні *Статута Вялікага княства Літоўскага 1529. Артыкулы вайсковыя*, якія дзейнічалі ў ВКЛ у 16—18 ст., былі першымі баявымі і дысцыплінарнымі статутамі арміі, а таксама зборнікамі вайскова-крымінальнага права. У 1754 паводле распараджэння Радзівіла ў Нясвіжы зроблена першае сістэматызаванае выданне актаў па вайск. праве Беларусі. У Расіі С.в. з'явіліся ў 2-й пал. 16 — пач. 17 ст., у 18 — пач. 20 ст. выдаваліся неаднаразова. С.в. для Чырв. Арміі выдадзены ў 1918—19. Са з'яўленнем новых відаў зброі, структурных змен у арганізацыі войска, здабытага баявога вопыту С.в. неаднаразова перапрацоўваліся. С.в., якія былі прыняты ў 1975 ва Узбр. Сілах СССР, у некат. краінах СНД, у т.л. Беларусі, дзейнічалі да сярэдзіны 1990-х г.

Ва Узбр. Сілах Рэспублікі Беларусь С.в. падзяляюцца на б а я в ы я (вызначаюць асновы падрыхтоўкі і вядзення баявых дзеянняў злучэнняў, часцей і падраздзяленняў відаў узбр. сіл і родаў войск, а таксама кіраванне імі; уводзяцца ў дзеянне загадам міністра абароны) і а г у л ь н а в о і н с к і я, да якіх адносяцца *Статут унутранай службы, Статут дысцыплінарны, Статут гарнізоннай і каравульнай службаў*. Агульнавоінскія статуты (за выключэннем Страявога статута) зацверджаны Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (2001). Іх нормы пашыраюцца і на ваеннаслужачых унутр. войск МУС, пагран. войск і інш. воінскіх фарміраванняў, а таксама на ваеннаабавязаных, якія прызваны на зборы.
С.М.Абрамаў, В.А.Юшкевіч.

СТА́ТУЯ (ад лац. statua), значная па памерах скульптурная выява чалавека ў рост (радзей жывёлы, фантаст. і інш. істоты), пастаўленая на пастамент; від круглай *скульптуры*. С. памерам настольнай скульптуры наз. с т а т у э т к а й, С. вялізных памераў — *калосам*. Конная С. паказвае наезніка на кані. Найб. пашыраны тып *помніка*.

СТА́ТЫКА (ад грэч. statikē вучэнне пра вагу, раўнавагу), раздзел механікі, які вывучае ўмовы раўнавагі цел пад уздзеяннем сіл. Адрозніваюць С. цвёрдага цела, С. пругка дэфармаванага цела, *гідрастатыку* і *аэрастатыку*.

У С. цвёрдага цела ўмовы раўнавагі сістэм сіл, што дзейнічаюць на яго, знаходзяць пры складанні сіл і замене іх эквівалентнай (звычайна больш простай) сістэмай сіл. Напр., сілы, прыкладзеныя ў адным пункце цела, можна замяніць *раўнадзейнай*, прыкладзенай у гэтым жа пункце. Умова раўнавагі свабоднага цела — роўнасць раўнадзейнай нулю, а таксама роўнасць нулю геам. сумы момантаў прыкладзеных сіл (гл. *Раўнавага* механічная сістэмы). Пры гэтым цела будзе знаходзіцца ў спакоі або рухацца раўнамерна і прамалінейна адносна дадзенай інерцыяльнай сістэмы адліку. Калі цела несвабоднае (да яго прыкладзены *сувязі механічныя*), то ва ўмовы раўнавагі ўключаюцца таксама сілы рэакцыі сувязей.

СТА́ТЫКА ЗБУДАВА́ННЯЎ, адзін з раздзелаў *будаўнічай механікі*, які вывучае ўздзеянне статычных нагрузак (напр., уласнай сілы цяжару канструкцый) на ўстойлівасць збудаванняў.

СТАТЫ́СТЫКА (нем. Statistik ад лац. status стан), 1) від грамадскай дзейнасці, скіраванай на атрыманне, апрацоўку і аналіз інфармацыі, якая характарызуе колькасныя заканамернасці жыцця грамадства ва ўсёй яго разнастайнасці (тэхн.-эканам., сац.-эканам., сац.-паліт. з'явы, культура). 2) Галіна грамадскай навукі, якая вывучае і сістэматызуе паказчыкі найб. тыповых масавых эканам., сац., паліт. з'яў і працэсаў, іх змены з цягам часу, надаючы ім лічбавае выражэнне.

Пачатак стат. практыкі адносіцца да часоў узнікнення дзяржавы. Элементарны ўлік зямель і насельніцтва вёўся ўжо ў стараж. Кітаі, Індыі, Егіпце, Грэцыі, Рыме, дзе перыядычна праводзілі *перапісы насельніцтва* і зямельных угоддзяў. З 16 ст. ў Францыі пачала складвацца гандлёвая С., у Англіі выдаваліся афіц. прэйскуранты і апісанні асобных дзяржаў з мноствам стат. звестак. У Зах. Еўропе пашырылася дэмаграфічная С. У Расіі стат. звесткі змяшчалі ў *пісцовых кнігах*, матэрыялах *рэвізій*. У 1811 пры Мін-ве паліцыі створана стат. аддзяленне, у 1852 створаны стат. к-т (перайменаваны ў 1859 у Цэнтр. стат. к-т) і стат. к-ты ў губернях. У ВКЛ праводзіліся *попісы войска Вялікага княства Літоўскага* (першы попіс адбыўся ў 1528), вяліся *інвентары* маёнткаў і тарыфаў падымнага падатку (гл. *Падымнае*). У 1764—94 дзейнічала Камісія скарбовая ВКЛ. Збору стат. матэрыялаў спрыяла ўведзеная на Беларусі *земская статыстыка*. Заснавальнікам стат. навукі лічыцца англ. вучоны-эканаміст У.*Петці*, які ў працы «Палітычная арыфметыка» (1683) вызначыў С. як апісальную навуку. Сістэм. выкарыстанне матэм. метадаў пры апрацоўцы стат. звестак увёў бельг. вучоны А.Кетле, які арганізаваў 1-ы міжнар. стат. кангрэс (1853). У Расіі навук. С. з'явілася ў 1770-я г. ў выглядзе «дзяржаўнаведства», прыхільнікі якога гал. задачай лічылі комплекснае апісанне дзяржаў (М.М.Шчарбатаў). Уклад у С. зрабілі К.Ф.Герман (1767—1838), Ю.Э.Янсан (1835—1893), Д.П.*Жураўскі*, А.Ч.Чупроў (1842—1908) і інш. У 1820—40-я г. выдадзены першыя стат. табліцы аб стане гарадоў, некалькі зборнікаў стат. звестак па Рас. імперыі. Губ. стат. к-ты выдавалі памятныя кніжкі і агляды губерняў, у якіх змяшчалі сабраную рознымі ведамствамі і апрацаваную С. прам-сці, землеўладання, с.-г., дэмагр., мед., адукацыі, судовую, пра склад і рух насельніцтва, стан гандлю, шляхоў зносін, сродкаў сувязі і інш. Памятныя кніжкі Віцебскай, Гродзенскай і Мінскай губ. пачалі выходзіць з 1860, Магілёўскай — з 1861; агляды — Магілёўскай губ. з 1878, Гродзенскай — з 1879, Віцебскай і Мінскай — з 1881. Першай стат. установай у БССР было Цэнтр. стат. бюро (з 1920), рэарганізаванае ў 1924 у Цэнтр. стат. ўпраўленне (ЦСУ) БССР. З утварэннем Рэспублікі Беларусь сістэма дзярж. С. перабудавана. Удасканальваюцца метады збору інфармацыі і вядзення колькаснага аналізу грамадскіх працэсаў ва ўмовах пераходу да рыначнай эканомікі; пашыраецца супрацоўніцтва з замежнымі стат. органамі, з Еўрастатам, Сусв. банкам, Міжнар. валютным фондам і інш. У 1992 прынята спец. праграма пераходу на міжнар. сістэму С. і ўліку. У 1994 створана Мін-ва С. і аналізу Рэспублікі Беларусь. Працуюць абласныя і Мінскае гар. ўпраўленні, ва ўсіх раёнах і буйных гарадах — аддзелы дзярж. С., якія дзейнічаюць на аснове Закона Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўнай статыстыцы» (1997). У 1998 створана Бел. стат. асацыяцыя, якая аб'ядноўвае спецыялістаў, занятых у С., і ставіць за мэту папулярызацыю стат. ведаў, пашырэнне прафес. міжнар. сувязей. Кадры ў галіне С. рыхтуюць у БДУ і Бел. дзярж. эканам. ун-це.

Своеасаблівае становішча С. ў сістэме навук вызначае яе арган. сувязь з навук. дысцыплінамі, якія вывучаюць асн. заканамернасці і якасныя асаблівасці розных з'яў і працэсаў у жыцці грамадства

(эканам. тэорыя, гісторыя, сацыялогія, матэматыка і інш.). Больш вядома С. як галіна практычнай дзейнасці. Практычная С. складаецца з агульнай тэорыі С., макраэканам. С. і С. галін эканомікі. Агульная тэорыя С. раскрывае метадалагічныя асновы арганізацыі назіранняў за масавымі з'явамі і працэсамі, сукупнасць метадаў апрацоўкі стат. звестак. Мнагамерны стат. аналіз (МСА) дазваляе апрацоўваць звесткі, якія характарызуюцца мноствам адзнак. Макраэканамічная С. — метадалагічны інструментарый для макраўзроўневага адлюстравання і аналізу эканомікі. Цэнтральнае месца ў ёй займае сістэма *нацыянальных рахункаў*. С. галін эканомікі — метадалагічны інструментарый і сістэма арганізац. мерапрыемстваў, які забяспечваюць збор, апрацоўку і звядзенне інфармацыі па галінах эканомікі (прам-сці, сельскай гаспадаркі, транспарту і інш.). Адрозніваюць таксама віды С., якія інтэгруюць паказчыкі розных галін (сац., працы, знешняга гандлю, матэрыяльных рэсурсаў і інш.). Асобнае месца займае С. дамашняй гаспадаркі і дэмаграфічная.

С. насельніцтва (дэмаграфічная) даследуе працэсы натуральнага і мех. руху насельніцтва. Вывучае яго колькасць і склад паводле полу, узросту, сямейных адносін, нацыянальнасці, адукацыі, размяшчэнне на тэр. краіны і яго міграцыю; аналізуе фактары дэмаграфічных працэсаў (нараджальнасць, смяротнасць, шлюбы і разводы, працягласць жыцця і інш.). Найб. дакладныя і падрабязныя звесткі пра колькасць, склад, размяшчэнне насельніцтва. У прамежках паміж перапісамі крыніцамі стат. звестак з'яўляюцца бягучыя рэгістрацыі актаў грамадзянскага стану, дамавыя кнігі і інш.

С. працы даследуе наяўнасць, склад і выкарыстанне прац. рэсурсаў, у т.л. колькасны склад рабочых і служачых, арганізацыю выкарыстання рабочага часу, узровень і дынаміку аплаты працы, прадукцыйнасць працы, баланс прац. рэсурсаў і вартасць рабочай сілы.

С. ўзроўню жыцця насельніцтва і сацыяльнай сферы даследуе жыццёвы ўзровень народа і параўноўвае яго з інш. краінамі. Яна фарміруецца на аснове аналізу паказчыкаў жыл.-камунальнай гаспадаркі, сац. абароны, аховы здароўя, грамадскага харчавання, гандлю, транспарту, сувязі, культуры, адукацыі, навукі і інш. Сістэма паказчыкаў уключае велічыню даходаў і спажывання на душу насельніцтва прадуктаў харчавання (і іх структуру) і непрадуктовых тавараў, паслуг сувязі, транспарту, устаноў аховы здароўя, культуры, грамадскага харчавання і гандлю, умовы жылля, працы і зарплаты, выкарыстанне вольнага часу і інш. Традыц. стат. даныя дапаўняюцца звесткамі спец. сацыялагічных абследаванняў, ацэнкамі экспертаў.

С. прыродных рэсурсаў і навакольнага асяроддзя вывучае велічыню, склад і выкарыстанне запасаў карысных выкапняў і аналізуе стан аховы навакольнага асяроддзя (атм. паветра, водныя, зямельныя, лясныя рэсурсы, жывёльны і раслінны свет). Уключае паказчыкі геалогіі і разведкі нетраў, лясной і воднай гаспадаркі, прыродаахоўнай дзейнасці розных галін эканомікі. Выкарыстоўваецца пры распрацоўцы дзярж., гасп.-адм. і грамадскіх мерапрыемстваў па захаванні і рацыянальным выкарыстанні кампанентаў навакольнага асяроддзя, для кантролю за выкананнем гэтых мерапрыемстваў і пры плянаванні буд-ва новых вытв. аб'ектаў (гл. таксама *Ахова зямель, Ахова лясоў, Ахова нетраў, Ахова прыроды, Ахова раслін*), а таксама пры распрацоўцы Сістэмы эколага-эканам. ўліку (СЭЭУ), якая дазваляе на міжнар. узроўні ацэньваць эканам. эфект узаемадносін грамадства і навакольнага асяроддзя.

С. нацыянальнага багацця даследуе і вядзе ўлік матэрыяльных і нематэрыяльных *актываў*, якімі валодае краіна і яе замежныя рэзідэнты. Адрозніваюць: вырабленыя нефін. актывы (асн. і абаротныя сродкі, каштоўнасці, маёмасць насельніцтва і інш.); нявырабленыя нефін. актывы (зямля, нетры, натуральныя біял., водныя рэсурсы і інш.); фін. актывы (манетарнае золата, грашовая наяўнасць, дэпазіты, акцыі і інш. каштоўныя паперы, спец. правы запазычання). Сістэма паказчыкаў: аб'ём і кампанентны склад нац. багацця, выкарыстанне і яго эфектыўнасць, працэс узнаўлення. Асн. палажэнні па класіфікацыі і ўліку нац. багацця змяшчае ў сабе сістэма нац. рахункаў.

С. прамысловасці даследуе працэсы і з'явы па галінах і рэгіёнах (аб'ём, структура і якасць вырабленай прадукцыі, яе рэалізацыя, запасы, рытмічнасць вытв-сці і інш.; фін. вынікі вытв. і камерцыйнай дзейнасці прамысл. прадпрыемстваў; умовы вытв. дзейнасці, у т.л. наяўнасць і выкарыстанне матэрыяльных і прац. рэсурсаў, аплата працы і яе прадукцыйнасць, укараненне дасягненняў навукі і тэхнікі і інш.

С. сельскай гаспадаркі вывучае працэсы і з'явы ў с.-г. вытв-сці. Дае магчымасць рабіць вывады пра стан і развіццё галіны, пра мэтазгоднасць існуючага размеркавання вытв-сці с.-г. прадукцыі па тэрыторыях і гаспадарках, ацэньваць узровень канцэнтрацыі і спецыялізацыі с.-г. вытв-сці, выяўляць рэзервы павышэння яе эфектыўнасці. Адыгрывае важную ролю пры вызначэнні харчовай і сыравіннай бяспекі краіны. Уключае С.: зямельнага фонду, раслінаводства, жывёлагадоўлі, с.-г. прадукцыі, нарыхтовак, мат.-тэхн. базы, а таксама адпаведныя раздзелы С. працы і фін. дзейнасці с.-г. прадпрыемстваў. Асн. крыніцы яе звестак — справаздачы калгасаў, саўгасаў, акц. т-ваў, фермерскіх гаспадарак, выбарачныя назіранні за падсобнымі гаспадаркамі насельніцтва, аднаразовыя ўлікі (склад працаўнікоў па адукацыі, перапісы ўгоддзяў, пасяўных плошчаў, жывёлы, асн. сродкаў і інш.).

С. будаўніцтва вывучае працэсы і з'явы, звязаныя з ажыццяўленнем капітальных укладанняў для ўзнаўлення асн. фондаў і з вытв. дзейнасцю буд-ва. Уключае С.: капітальных укладанняў, дзейнасці буд. і праектна-пошукавых арг-цый. Сістэма паказчыкаў: аб'ёмы інвестыцый, іх склад і крыніцы, увод у дзеянне асн. фондаў і вытв. магутнасцей, аб'ём незавершанага буд-ва, буд.-мантажных работ, праектна-пошукавых работ і інш. Разам са справаздачнасцю крыніцамі звестак з'яўляюцца перапісы, аднаразовыя ўлікі і абследаванні.

С. транспарту вывучае працэсы і з'явы, якія адбываюцца ў гэтай галіне. Адрозніваюць грузавыя і пасажырскія перавозкі, работу розных відаў транспарту (аўтамаб., чыг., гар. эл., рачны, паветраны, трубаправодны). Да спецыфічных яе паказчыкаў адносяцца: аб'ём перавозак, эксплуатацыя транспарту, стан парка трансп. сродкаў, працягласць і стан шляхоў зносін і інш.

С. сувязі вывучае працэсы развіцця сетак сувязі і эксплуатацыйнай дзейнасці прадпрыемстваў паштовай, тэлеграфнай, тэлефоннай сувязі, радыёвяшчання і тэлебачання. Да спецыфічных паказчыкаў адносяцца: развіццё і размяшчэнне сеткі ўсіх відаў сувязі (стацыянарныя прадпрыемствы, лінейныя збудаванні, пункты), якасць абслугоўвання (хуткасць і надзейнасць дастаўкі інфармацыі) і інш.

С. гандлю вывучае працэсы і з'явы, якія адбываюцца ў сферы тавараабарачэння: таварна-грашовы абмен, тавараабарот, узровень і рух рознічных цэн, якасць гандл. абслугоўвання, развіццё і размяшчэнне сеткі гандл. прадпрыемстваў і інш. Да спецыфічных паказчыкаў адносяцца таварныя запасы і іх абарачальнасць. Аналіз дынамікі цэн спажывецкіх тавараў дае магчымасць рабіць вывад пра ўзровень інфляцыі. Збор звестак вядзецца ў двух кірунках: справаздачнасць буйных гандл. прадпрыемстваў і выбарачнае назіранне за сярэднімі, дробнымі і рынкамі.

С. фінансаў вывучае з'явы і працэсы ў сферы фінансава-грашовага абарачэння і крэдыту. Адлюстроўвае наяўнасць фін. рэсурсаў, іх рух і дзейнасць фін.-крэдытных устаноў. Уключае С.: грашовага абарачэння, дзярж. фінансаў, фінансаў прадпрыемстваў, страхавання, падаткаў і падатковай сістэмы, каштоўных папер і фондавых біржаў, банкаўскую, крэдыту. Дазваляе распрацоўваць балансы фін. рэсурсаў, вылічваць бягучыя і будучыя крэдытныя стаўкі, плацежаздольнасць прадпрыемстваў і ўстаноў, падатковых даходаў, валютнай ліквіднасці і інш.

С. знешняга гандлю вывучае

аб'ёмы, структуру і дынаміку знешняга гандлю, яго геагр. размеркаванне, склад тавараў, долю краіны ў сусв. тавараабароце, а таксама ролю знешняга гандлю ў эканоміцы краіны. Вядзе ўлік імпарту, экспарту і транзіту ў вартасных і колькасных выражэннях. Асн. крыніцы звестак — справаздачы прадпрыемстваў-экспарцёраў і мытных устаноў.

Літ.: Миллс Ф. Статистические методы: Пер. с англ. М., 1958; Казаченок А.Г., Черванев Д.Л. История развития государственной статистики в БССР. Мн., 1969; Всемирная история экономической мысли. Т. 1—6. М., 1987—97; Долан Э.Дж., Линдсей Д. Макроэкономика: Пер. с англ. СПб., 1994; Елисеева И.И., Костеева Т.В., Хоменко Л.Н. Международная статистика. Мн., 1995; Статистика: нац. счета, показатели и методы анализа. Мн., 1995; Историческая информатика. Мн., 1998. *В.М.Тамашэвіч.*

СТАТЫ́СТЫКІ НДІ Міністэрства статыстыкі і аналізу Рэспублікі Беларусь. Засн. ў 1993 у Мінску з мэтай правядзення фундаментальных і прыкладных даследаванняў у галіне статыстыкі, распрацоўкі і рэалізацыі дзярж. праграм яе ўдасканалення, укаранення ў стат. практыку міжнар. стандартаў, аказання інфарм. паслуг, папулярызацыі стат. ведаў і стат. інфармацыі. Асн. кірункі дзейнасці: даследаванне макраэканам. працэсаў; маніторынг і прагназіраванне дэмаграфічнай сітуацыі; распрацоўка канцэпцый дэмаграфічнай палітыкі; даследаванне праблем ценявой эканомікі; статыстыка навукі і інавацыйнай дзейнасці; распрацоўка сістэмы эколага-эканам. ўліку; тэарэт. абгрунтаванне і аналіз звестак выбарачных даследаванняў; апрацоўка звестак метадамі традыц. і мнагамернай статыстыкі; стварэнне інфарм. сістэм на CD ROM; інфарм. абслугоўванне, правядзенне маркетынгавых абследаванняў; канструяванне і стварэнне баз даных эканам. і бізнес інфармацыі і інш. У ін-це распрацаваны методыкі: уліку нефармальнай эканомікі; арг-цыі выбарачных абследаванняў; разліку аб'ёмаў валавой прадукцыі і ацэнкі сезонных ваганняў вытв-сці ў сельскай гаспадарцы; ацэнкі прыродных рэсурсаў, будовы экалагічных рахункаў; правядзення перапісу насельніцтва 1999; прагнозу колькасці і полаўзроставай структуры насельніцтва Беларусі і інш. З 1999 выдае зб. навук. прац «Актуальная статыстыка».

Літ.: Тамашевич В.Н. Белорусскому институту статистики — 5 лет // Вопр. статистики. 1999. №5.

СТАТЫСТЫ́ЧНАЕ АЦЭ́НЬВАННЕ, сукупнасць метадаў *матэматычнай статыстыкі* для набліжанага вызначэння невядомых *размеркаванняў* імавернасці ці інш. імавернасных характарыстык па выніках назіранняў.

У большасці выпадкаў вынікі назіранняў утвараюць паслядоўнасць незалежных выпадковых велічынь, якія маюць адно і тое ж (невядомае) размеркаванне імавернасцей з некаторай функцыяй размеркавання. Лічаць, што гэтая функцыя размеркавання належыць да якой-н. сям'і, залежнай ад канечнай колькасці параметраў, і вызначэнню падлягаюць толькі гэтыя параметры. Распрацаваны таксама метады С.а. ¹для выпадкаў узаемна залежных вынікаў назіранняў і інш. Гл. таксама *Статыстычны аналіз* выпадковых працэсаў.

СТАТЫСТЫ́ЧНАЕ МАДЭЛІ́РАВАННЕ, устанаўленне стат. заканамернасцей з дапамогай лагічных канструкцый, фармальных ураўненняў або іх сістэм. Грунтуецца на шматлікіх назіраннях за працэсамі, з'явамі, аб'ектамі. Сярод стат. мадэлей вылучаюць эканаметрычныя (разнавіднасць эканоміка-статыстычных), якія будуюцца на аснове метадаў *матэматычнай статыстыкі*. Гэтыя мадэлі шырока выкарыстоўваюцца пры вывучэнні суадносін вынікаў вытв. дзейнасці і затрачаных прац. і матэр. рэсурсаў, рыначнага попыту і інш. Гл. таксама *Мадэліраванне, Мадэліраванне* ў навуцы і тэхніцы, *Мадэліраванне сацыяльнае, Мадэліраванне эканоміка-матэматычнае*. *В.М.Тамашэвіч.*

СТАТЫСТЫ́ЧНАЕ НАЗІРА́ННЕ, навукова арганізаваны, планамерны збор звестак пра падзеі і працэсы сац.-эканам. жыцця грамадства. Адрозніваюць С.н. суцэльнае і выбарачнае. Суцэльнае — назіранне, пры якім абследуюцца ўсе без выключэння аб'екты назірання (перапіс насельніцтва, суб'ектаў гаспадарання, стат. аналіз бягучай справаздачнасці і інш.). Адной з яго форм з'яўляецца аднаразовы ўлік. Напр., стат. органы праз 2—3 гады робяць улік колькасці рабочых па прафесіях, разрадах, узросце і інш., спецыялістаў — па адукацыі і г.д. Выбарачнае — назіранне, пры якім робіцца абследаванне толькі часткі аб'ектаў назірання пры ўмове, што гэта частка адбіраецца аб'ектыўна, незалежна ад волі даследчыка і мае такую колькасць, каб у ёй змаглі выявіцца заканамернасці аб'екта назірання. Гл. таксама *Назіранне*. *Н.Ч.Бокун.*

СТАТЫСТЫ́ЧНАЕ РАШЭ́ННЕ ў матэматычнай статыстыцы, рашэнне, прынятае па выніках назіранняў якой-н. з'явы, што падпарадкоўваецца не поўнасцю вядомым імавернасным заканамернасцям. Лічаць, што адпаведнае *размеркаванне* імавернасцей залежыць ад значэння невядомага параметра, якое ацэньваецца па выніках назіранняў. Дакладная матэм. фармулёўка паняццяў, датычных да С.р. і спосабаў іх параўнання, разглядаецца ў *статыстычных рашэннях тэорыі*.

Напр., пры хараванні вады колькасць дадзенага хлору залежыць ад сярэдняй колькасці бактэрый у адзінцы аб'ёму вады. Гэта значэнне ацэньваецца па выніках падліку колькасці бактэрый у незалежна выбраных адзінках аб'ёму пры дапушчэнні, што незалежныя выпадковыя велічыні маюць аднолькавае *Пуасона размеркаванне* з невядомым матэм. чаканнем, роўным шуканай сярэдняй колькасці бактэрый. С.р. аб колькасці дадзенага хлору залежыць ад якой-н. стат. ацэнкі сярэдняй колькасці, выбранай з улікам рызыкі непажаданых наступстваў: заніжаная колькасць хлору вядзе да недастатковага абеззаражвання вады, завышаная — да пагаршэння, напр., смакавых якасцей вады.

СТАТЫСТЫ́ЧНАЯ ВАГА́ ў квантавай механіцы, кратнасць *выраджэння* ўзроўню энергіі. С.в. ў квантавай статыстыцы — колькасць квантавых станаў фіз. сістэмы з пэўнай энергіяй (ці з энергіяй у дадзеным вузкім інтэрвале, калі яна мае неперарыўныя значэнні). С.в. ў класічнай статыстыцы — значэнне элемента аб'ёму ў *фазавай прасторы* для макраскапічнай фіз. сістэмы. С.в. ў тэрмадынаміцы — тое, што *імавернасць тэрмадынамічная*.

СТАТЫСТЫ́ЧНАЯ МАДЭ́ЛЬ, матэматычная мадэль, дзе назіраная фіз. велічыня разглядаецца як *выпадковая велічыня* з імавернаснымі характарыстыкамі, якія падлягаюць вызначэнню ці ацэньванню. Гл. таксама *Монтэ-Карла метад, Статыстычнае ацэньванне, Статыстычнае мадэліраванне, Статыстычнае рашэнне*.

СТАТЫСТЫ́ЧНАЯ МЕХА́НІКА, тое, што *статыстычная фізіка*. Тэрмін уведзены Дж.У.*Гібсам* і найчасцей выкарыстоўваецца як назва раздзелаў статыстычнай фізікі, заснаваных на *Гібса размеркаванні*, уяўленнях аб *статыстычным ансамблі* і *фазавай прасторы*.

СТАТЫСТЫ́ЧНАЯ РАДЫЁТЭ́ХНІКА, раздзел *радыётэхнікі*, які вывучае задачы аналізу і сінтэзу радыётэхн. апаратаў і сістэм з улікам наяўнасці радыёперашкод і выпадковага характару сфарміраваных і прынятых радыёсігналаў.

Асн. кірункі даследаванняў: аналіз унутраных флуктуацыйных шумаў у элементах радыёапаратуры — *шротавы эфект* у электравакуумных і паўправадніковых прыладах (выяўлены ням. вучоным В.Шоткі; 1918—22), цеплавы шум у рэзістарах (амер. фізік Х.Найквіст; 1928); стат. характарыстыкі знешніх перашкод, напр., атм., індустр. і касм. шумаў (М.Дз.*Папалексі*); скажэнні радыёсігналаў пры іх распаўсюджванні ў розных умовах (каналы наземнай, іанасфернай, трапасфернай, метэорнай, касм. сувязі і інш.). Сінтэз радыёэлектронных сістэм і апаратаў, якія працуюць пры ўздзеянні перашкод, заснаваны на метадах матэм. статыстыкі, дазваляе ацаніць лімітныя магчымасці і вызначыць алгарытмы канструявання такіх сістэм.

На Беларусі даследаванні па праблемах С.р. і статыстычнай радыёфізікі праводзяцца ў БДУ, Бел. ун-це інфарматыкі і радыёэлектронікі і інш.

Літ.: Артемьев В.М. Теория динамических систем со случайными изменениями структуры. Мн., 1979; Чердынцев В.А. Статистическая теория совмещенных радиотехнических систем. Мн., 1980; Тихонов В.И. Статистическая радиотехника. 2 изд. М., 1982. *В.А.Чардынцаў.*

СТАТЫСТЫ́ЧНАЯ РАДЫЁФІ́ЗІКА, раздзел *радыёфізікі*, які вывучае флуктуацыйныя з'явы пры генерацыі, выпрамяненні, распаўсюджванні і прыёме радыёхваль. У больш шырокім сэнсе — даследуе стат. заканамернасці вагальных і хвалевых працэсаў, напр., *кагерэнтнасці*, праблем узаемадзеяння сіг-

налаў і шумаў у нелінейных сістэмах. З'явы і заканамернасці С.р. ўлічваюцца пры распрацоўцы сістэм радыёлакацыі, радыёнавігацыі, радыёсувязі і інш. на асн. этапах перадачы інфармацыі.

СТАТЫСТЫ́ЧНАЯ РАЎНАВА́ГА, гл. *Раўнавага статыстычная*.

СТАТЫСТЫ́ЧНАЯ СУ́МА, велічыня, адваротная нарміравальнаму множніку кананічнага *Гібса размеркавання* ў квантавай статыстычнай фізіцы. С.с. $Z = \Sigma_i \exp(-E_i/kT)$, дзе E_i — энергія сістэмы ў i-тым квантавым стане, k — *Больцмана пастаянная*, T — абс. т-ра. Складанне праводзіцца па ўсіх дапушчальных (у т.л. з аднолькавай энергіяй) станах. С.с. дазваляе вызначыць *патэнцыялы тэрмадынамічныя* сістэмы ў залежнасці ад т-ры, аб'ёму, колькасці часціц і характару іх узаемадзеяння.

СТАТЫСТЫ́ЧНАЯ ФІ́ЗІКА, раздзел тэарэтычнай фізікі, які вывучае ўласцівасці сістэм з вялікай колькасцю часціц (малекул, атамаў, іонаў, электронаў, фатонаў і інш.). Вызначае ўплыў мікраструктуры рэчыва на ўсе яго фіз. ўласцівасці (дыэлектрычныя, вязкія, пругкія, акустычныя і інш.). У С.ф. ўваходзіць статыстычная тэрмадынаміка, якая вывучае ўласцівасці рэчыва ў стане статыстычнай раўнавагі (нераўнаважныя ўласцівасці і працэсы даследуе *кінетыка фізічная*), вызначае залежнасць паміж ціскам, аб'ёмам і т-рай у сістэме (ураўненне стану рэчыва) у адпаведнасці з характарам сіл міжмалекулярнага ўзаемадзеяння. Метады С.ф. выкарыстоўваюцца ў тэорыі атама, атамнага ядра, радыёфізіцы, астрафізіцы і інш.

Падзяляецца на класічную і квантавую. Асновы класічнай С.ф. закладзены ў 2-й пал. 19 ст. працамі Р.Клаўзіуса, Дж.К.Максвела, Л.Больцмана, Дж.Гібса. Квантавая С.ф., заснаваная на законах *квантавай механікі*, распрацавана ў 1-й пал. 20 ст. Матэм. аснова С.ф. — *імавернасцей тэорыя*. Паводзіны часціц вызначаюцца законам размеркавання — функцыяй, якая ўстанаўлівае імавернасць знаходжання любой групы часціц у пэўным інтэрвале скарасцей у зададзенай частцы аб'ёму. С.ф. паказвае сувязь закону размеркавання з тэрмадынамічнымі функцыямі, якія апісваюць сістэму як суцэльнае асяроддзе. Закон размеркавання ў энергетычным выяўленні дае імавернасць дадзенай частцы часціц мець поўную энергію ў пэўным інтэрвале значэнняў. Паводле закону размеркавання выражаюцца частковыя функцыі размеркавання (карэлятыўныя функцыі), якія вызначаюць паводзіны асобных груп малекул. Карэлятыўныя функцыі задавальняюць сістэму інтэградыферэнцыяльных ураўненняў. Асобнае значэнне маюць унарная і бінарная функцыі, праз якія вызначаюцца асн. характарыстыкі сістэмы і структура рэчыва. У нераўнаважным стане закон размеркавання становіцца складанай функцыяй часу. Аналаг карэлятыўных функцый у нераўнаважным стане — кінетычныя функцыі. У канцы 20 ст. дасягнуты значныя вынікі ў С.ф. неабарачальных працэсаў (адкрытых сістэм), у разуменні ўзнікнення ўпарадкаванасці ў першапачатковым хаатычным стане рэчыва.

На Беларусі пытанні С.ф. распрацоўваюцца ў ін-тах фіз. профілю Нац. АН, Бел. тэхнал. ун-це, БДУ і інш.

Літ.: Боголюбов Н.Н. Проблемы динамической теории в статистической физике. М.; Л., 1946; Ротт Л.А. Статистическая теория молекулярных систем. М., 1979; Климонтович Ю.Л. Статистическая теория открытых систем. Ч. 1—3. М., 1995—2001; Немцов В.Б. Неравновесная статистическая механика с ориентационным порядком. Мн., 1997. *Л.А.Рот.*

СТАТЫСТЫ́ЧНЫ АНА́ЛІЗ выпадковых працэсаў, раздзел *матэматычнай статыстыкі*, дзе разглядаюцца метады апрацоўкі і выкарыстання стат. даных, якія адносяцца да выпадковых працэсаў.

Найб. важны клас задач С.а. — задачы выяўлення сігналаў на фоне шуму, што мае дастасаванні ў радыёлакацыі. Задачы *статыстычнага ацэньвання* параметраў узнікаюць, калі па выніках назіранняў за значэннямі параметраў працэсу на працягу пэўнага прамежка часу неабходна вылічыць значэнні гэтых параметраў у моманты часу па-за межамі часу назірання або вылічыць значэнні параметраў дапаможнага працэсу, статыстычна звязанага з назіраным. Шэраг задач С.а. адносяць да задач на непараметрычныя метады статыстыкі, напр., задачы на вызначэнне *размеркавання* імавернасцей дадзенага працэсу па выніках назіранняў. Існуюць таксама метады С.а. выпадковых працэсаў, дзе яны разглядаюцца як маркаўскія працэсы ці як кампаненты мнагамернага працэсу, які задавальняе пэўную сістэму стахастычных дыферэнцыяльных ураўненняў.

СТАТЫСТЫ́ЧНЫ АНСА́МБЛЬ у фізіцы, сукупнасць вялікай (у граніным выпадку бясконцай) колькасці аднолькавых неўзаемадзейных фіз. сістэм («копій» дадзенай сістэмы), якія знаходзяцца ў аднолькавых макраскапічных станах. Пры гэтым мікраскапічныя станы сістэм, што складаюць С.а., могуць адрозніваццца, аднак сукупнасць іх павінна адпавядаць зададзеным значэнням макраскапічных параметраў з дакладнасцю да неістотна малых флуктуацый. С.а. — адно з асноўных паняццяў *статыстычнай фізікі*, якое дазваляе выкарыстоўваць метады *імавернасцей тэорыі* для апісання ўласцівасцей фіз. сістэм.

СТАТЫСТЫ́ЧНЫХ ВЫПРАБАВА́ННЯЎ МЕ́ТАД, тое, што *Монтэ-Карла метад*.

СТАТЫСТЫ́ЧНЫХ РАШЭ́ННЯЎ ТЭО́РЫЯ, раздзелы *матэматычнай статыстыкі* і *гульняў тэорыі*, якія даюць магчымасць з аднолькавых пазіцый разглядаць задачы стат. праверкі гіпотэз, пабудовы стат. ацэнак параметраў і даверальных інтэрвалаў для іх, планавання эксперыментаў і інш. Асн. задача — адшуканне *статыстычнага рашэння* ці вырашальнага правіла (функцыі), што дазваляе па выніках назіранняў меркаваць аб сапраўдным (але невядомым) *размеркаванні* імавернасцей назіранай велічыні.

СТАТЫСТЫ́ЧНЫЯ І ДЫНАМІ́ЧНЫЯ ЗАКО́НЫ, статыстычныя заканамернасці і заканамернасці жорсткай дэтэрмінацыі, асноўныя тыпы заканамернасцей сувязі з'яў, якія атрымалі найб. поўнае выяўленне ў сучаснай навуцы. Адрозніваюцца па ўнутр. структуры адпаведных навук. тэорый і агульных падыходах да прыроды быцця і пазнання. Дынамічныя законы характэрны для адносна ізаляваных *сістэм*, што складаюцца з невял. колькасці элементаў, дзе можна абстрагавацца ад выпадковых фактараў. У законах гэтага тыпу прадказанні дакладна вызначаныя і адназначныя (напр., законы руху макраскапічных аб'ектаў). Уяўленні пра дынамічныя законы сфарміраваліся ў працэсе развіцця класічнай механікі. Абсалютызацыя законаў гэтага тыпу характэрна для канцэпцыі мех. *дэтэрмінізму*, прыхільнікі якой экстрапаліравалі *Ньютана законы механікі* на ўсе з'явы і працэсы свету (П.Лаплас і інш.). Пры дапамозе дынамічных законаў фармулююцца каузальныя сувязі з'яў. Пры аналізе сістэм, якія складаюцца з вялікай колькасці аб'ектаў (часціц), а таксама сац. і біял. з'яў найб. адэкватныя статыстычныя законы. Яны распрацаваны ў працэсе развіцця класічнай *статыстычнай фізікі* і метадалагічнай асновай іх з'яўляецца *імавернасцей тэорыя*. Стат. законы носяць імавернасны характар, што абумоўлена дзеяннем мноства выпадковых фактараў і ўзаемадзеяннем вял. колькасці элементаў (напр., вял. колькасць малекул у газе, асобін у біял. папуляцыях, людзей у сац. калектывах). За сукупным дзеяннем розных фактараў яны выяўляюць устойлівае і неабходнае. У сац. сферы сац. законы дзейнічаюць як законы масавых з'яў і звязаны з *вялікіх лікаў законам*. Метады выяўлення стат. законаў распрацаваны ў сац. *статыстыцы*.

СТАТЫСТЫ́ЧНЫЯ ПУБЛІКА́ЦЫІ, зборнікі і інш. статыстычныя публікацыі, якія выдаюцца органамі дзярж. кіравання або недзярж. арг-цыямі. Адрозніваюць міжнар. С.п. (ААН, Еўрастата, Статкамітэта СНД і інш.) і нац. выданні дзярж. стат. органаў. У Расійскай імперыі сістэм. С.п. пачаліся ў 1866. У 1870 выдадзены «Працы Мінскага губернскага статыстычнага камітэта», у 1872 — «Працы Віцебскага губернскага статыстычнага камітэта» і інш. Першы стат. зборнік у СССР апублікаваны ў 1924, у БССР — у 1925. Мін-ва статыстыкі і аналізу Рэспублікі Беларусь штогод выдае больш за 30 стат. зборнікаў. Найб. поўна сац.-эканам. стан рэспублікі адлюстроўваецца ў «Статыстычным штогодніку Рэспублікі Беларусь» і ў выданні «Рэспубліка Беларусь у лічбах». Штогод выдаюцца таксама тэматычныя зборнікі па асобных галінах: «Прамысловасць Рэспублікі Беларусь», «Аграпрамысловы комплекс Рэспублікі Беларусь», «Транспарт і сувязь Рэспублікі Беларусь», «Навука Рэспублікі Беларусь», «Рознічны гандаль Рэспублікі Беларусь», «Навакольнае асяроддзе і прыродныя рэсурсы Рэспублікі Беларусь», «Платныя паслугі насельніцтву Рэспублікі Беларусь», «Грашовыя даходы і рас-

ходы насельніцтва Рэспублікі Беларусь», «Нацыянальныя рахункі Рэспублікі Беларусь» і інш. Штомесяц стат. інфармацыя пра работу нар. гаспадаркі, знешні гандаль, занятасць насельніцтва, аплату працы, цэны і тарыфы, інвестыцыі, спажывецкі рахунак друкуецца ў «Статыстычным бюлетэні» і дакладзе «Аб рабоце народнай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь». *Т.Р.Гайдукевіч.*

СТАЎБУ́Н, вёска ў Веткаўскім р-не Гомельскай вобл., на р. Стаўбунка. Цэнтр сельсавета і саўгаса. За 33 км на ПнУ ад г. Ветка, 55 км ад Гомеля. 1265 ж., 552 двары (2001). Лясніцтва. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аптэка, аддз. сувязі. Свята-Мікольская царква.

СТАЎБУ́НКА, рака ў Гомельскай вобл. Беларусі і Бранскай вобл. Расіі, левы прыток р. Беседзь (бас. р. Дняпро). Даўж. 22 км. Пл. вадазбору 192 км^2. Пачынаецца на паўн. ускраіне в. Стаўбунка ў Бранскай вобл., вусце каля в. Жалезнікі Веткаўскага р-на. Рэчышча на працягу 17,3 км (ад мяжы з Расіяй да в. Стаўбун Веткаўскага р-на) каналізаванае.

СТАЎБЦО́ЎСКАЯ РАЎНІ́НА. На ПдЗ Мінскай і У Гродзенскай абласцей, у бас. верхняга цячэння р. Нёман. Мяжуе з Мінскім узвышшам, Нёманскай нізінай, Цэнтральнабярэзінскай раўнінай, Капыльскай градой. Выш. 150—200 м.

У тэктанічных адносінах С.р. прымеркавана да цэнтр. ч. *Беларускай антэклізы*, дзе Цэнтральнабеларускі масіў сучляняецца з Валожынскім грабенам. Складзена з ніжнепратэразойскіх гнейсаў, кварцытаў, верхнемелавых мергельна-мелавых моцна апясчаненых парод, антрапагенавых чырвона-бурых марэнных супескаў і суглінкаў, месцамі перакрытых водна-ледавіковымі розназярністымі пяскамі і супескамі. Магутнасць антрапагенавых асадкаў 100—150 м.

Раўніна фарміравалася ў зоне акумуляцыі сожскага ледавіка, пасля адступання якога значна перапрацавана эразійна-дэнудацыйнымі працэсамі. Паверхня спадзіста-хвалістая, месцамі ўзгорыста-хвалістая. Адносныя выш. 3—7 м. Трапляюцца забалочаныя і затарфаваныя лагчыны, часам з вадацёкамі, на водападзелах — тэрмакарставыя западзіны, прыдалінныя ўчасткі парэзаны лагамі, зрэдку ярамі. Карысныя выкапні: мел, пясчана-жвіровы матэрыял, буд. пяскі, легкаплаўкія гліны. Раўніну перасякае р. Нёман з прытокамі Уса, Альхоўка, Тур'я, Гавязнянка. Пераважаюць глебы дзярнова-падзолістыя, у паніжэннях — дзярнова-падзолістыя забалочаныя, у далінах рэк — дзярнова-глеістыя (поймавыя) з участкамі тарфяна-балотных. Лясістасць 30%. Вял. масівы на Пн раўніны. Пераважаюць хвойнікі і ельнікі верасовыя і імшыстыя. Трапляюцца дубровы і другасныя бярэзнікі, у паніжэннях — чорнаалешнікі са сфагнавымі балотамі. Паверхня значна разараная. На тэр. раўніны *Коласаўскі заказнік*.

СТАЎБЦО́ЎСКІ КЛЯ́ШТАР ДАМІНІКА́НЦАЎ. Існаваў у 1623—1830 у г. Стоўбцы. Засн. трокскім ваяводам А.Слушкам і яго жонкай Соф'яй, якія далі кляштару ў якасці фундуша фальваркі Кучкуны, Атцэда і 6 тыс. злотых. Мураваны 3-нефавы касцёл св. Казіміра пабудаваны ў 1645. У каменную падлогу былі ўмураваны 13 мармуровых надмагільных пліт, у сцены — мармуровыя эпітафіі 18 ст. У скляпах касцёла хавалі прадстаўнікоў феад. знаці (найперш *Слушкаў*) і духоўных асоб. У 1681 удава падскарбія надворнага ВКЛ Б.Ю.Слушкі Г.Патоцкая падаравала кляштару 10 тыс. злотых, на якія віленскія скульптары аздобілі інтэр'ер касцёла стукавай ляпнінай. У 1830 кляштар скасаваны. У 1865 касцёл закрыты, у 1867—83 ён пераабсталяваны пад правасл. царкву св. Марыі Магдаліны, у 1950-я г. разбураны. У 2-павярховым жылым корпусе кляштара пасля скасавання размяшчалася нар. жаночае вучылішча (будынак не захаваўся). *А.А.Ярашэвіч.*

СТАЎБЦО́ЎСКІ ПАВЕ́Т, адм.-тэр. адзінка ў 1921—40 у Навагрудскім ваяв. Польшчы, у 1939—40 у БССР. Цэнтр — мяст. *Стоўбцы*. Утвораны ў канцы 1920 на частцы тэр. б. Мінскага пав., акупіраванай польск. войскамі. Уключаў 7 гмін: Засульскую, Заслаўскую, Івянецкую, Пяршайскую, Ракаўскую, Свержанскую, Стаўбцоўскую. З 4.2.1921 у Навагрудскім ваяв. У 1923 уключаў 8 гмін: Валмянскую, Засульскую, Івянецкую, Навасвержанскую, Пяршайскую, Ракаўскую, Рубяжэвіцкую, Стаўбцоўскую. 13.1.1926 Валмянская, Івянецкая і Пяршайская гміны перададзены ў Валожынскі пав.; да С.п. далучаны Дзераўноўская, Жухавіцкая, Мірская, Ярэміцкая, 20.5.1930 Налібоцкая гміны з суседніх паветаў. У вер. 1939 павет заняты Чырв. Арміяй, з 14.11.1939 у БССР, з 4 снеж. ў Баранавіцкай вобл. 15.1.1940 С.п. скасаваны, яго тэрыторыя падзелена паміж Івянецкім, Мірскім і Стаўбцоўскім р-намі. *В.Л.Насевіч.*

СТАЎБЦО́ЎСКІ РАЁН. Размешчаны на З Мінскай вобл. Утвораны 15.1.1940 (у сучасных межах з 17.4.1962). Пл. 1,9 тыс. км^2. Нас. 46,9 тыс. чал. (2002), гарадскога 35,8%. Сярэдняя шчыльн. 25 чал. на 1 км^2. Цэнтр — г. *Стоўбцы*. Уключае 200 сельскіх нас. пунктаў, 15 сельсаветаў: Аталезскі, Варацішчанскі, Вішнявецкі, Залужскі, Засульскі, Заямнаўскі, Літвенскі, Мікалаеўшчынскі, Навасвержанскі, Налібацкі, Рубяжэвіцкі, Слабадскі, Хатаўскі, Цясноўскі, Шашкоўскі.

Большая паўд. ч. раёна ў межах *Стаўбцоўскай раўніны*, паўн.-зах. — *Верхнянёманскай нізіны*, паўн.-ўсх. — на *Мінскім узвышшы*. Паверхня раўнінная хвалістая, на ПнУ дробнаўзгорыстая. Пераважаюць выш. 180—200 м (57%), 18% паверхні на выш. 200—250 м. Найвыш. пункт 340 м (г. Дубавая каля в. Вірлавічы). Агульны нахіл з ПнУ да далін р. Нёман. Карысныя выкапні: торф, жалезная руда (*Аколаўскае радовішча жалезных руд*аў), пясчана-жвіровы матэрыял, гліны, буд. пяскі. Сярэдняя т-ра студз. -6,5 °С, ліп. 17,7 °С. Ападкаў 613 мм за год. Вегетац. перыяд 190 сут. Гал. р. Нёман і яго прытокі Сула з Перакуллю, Волкай, Тонвай, Сярмяжкай, Ячонка, Альхоўка, Гавязнянка, Жацераўка, Залужанка, Уса з Шурай, воз. Кромань; вадасх. Стаўбцоўскае на р. Залужанка. Пераважаюць дзярнова-падзолістыя (60,1%), дзярнова-падзолістыя забалочаныя (14,4%) і тарфяна-балотныя (12,9%) глебы. Пад лесам 44% тэр. раёна, найб. лясістасць на Пн і ПнЗ. Лясы хваёвыя, яловыя, бярозавыя, чорнаальховыя, дубровы і інш. Балоты займаюць 2% пл., найб. Хмелішча, Гуменаўшчына, Гавязнянка. На тэр. раёна ахоўныя тарфянікі: Грань, Гуменаўшчына, Крывуха, Ліўе, пойма р. Гавязнянка, Сверынава, Стары Нёман, Сула, Хмелішча, Юзяфінава, Ячонскае. Помнікі прыроды рэсп. значэння: ліпы амерыканскія ў в. Вял. Двор, ліпы драбналістыя каля в. Мікалаеўшчына, хвойнік у Кульскім лясніцтве. Помнікі прыроды мясц. значэння: бат. паркі Новая Вёска ў в. Вял. Двор; у в. Сула; Хатава ў пас. Школьны, сядзіба Ф.Э.Дзяржынскага з участкам лесу на З ад в. Пятрылавічы. Зоны адпачынку Кругліца, Мікалаеўшчына.



Агульная пл. с.-г. угоддзяў 68,1 тыс. га, з іх асушаных 17,7 тыс. га. У раёне на 1.1.2002 17 калгасаў, аграфірма «ПМК-74 — Налібакі», аграпрамысл. гандл. прадпрыемства «Магістраль», 10 фермерскіх гаспадарак. Асн. галіны сельскай гаспадаркі: мяса-малочная жывёлагадоўля і цукровае буракаводства. Вырошчваюць збожжавыя і кармавыя культуры, бульбу. Прадпрыемствы харч. (малочныя, садавінна-агародніннныя, хлебабулачныя, мясныя і інш. прадукты), дрэваапр. (піламатэрыялы, мэбля), паліўнай (торфабрыкет) прам-сці; лясгас, тарарамонтнае прадпрыемства, філіял Мінскага маторнага з-да і інш. Па тэр. раёна праходзіць чыгунка Мінск—Баранавічы, аўтамагістраль Брэст—Мінск, аўтадарогі: Стоўбцы—Кобрын, Пяршаі—Нясвіж, Івянец—Стоўбцы, Рубяжэвічы—Дзяржынск,

Мір—Стоўбцы, Нясвіж—Навагрудак. Транзітныя газаправоды Таржок (Расія)—Мінск— Івацэвічы (з адгалінаваннем на Стоўбцы, Новы і Стары Свержань) і Ямал (Расія)—Зах. Еўропа. У раёне 24 сярэднія, 7 базавых, 7 пач. школ, 2 школы-садкі, школа-інтэрнат, 3 школы мастацтваў, 3 муз. школы, 31 дашкольная ўстанова, сірочы дом, дзіцячы прытулак, 18 дамоў культуры, 9 клубаў, 36 б-к, 5 бальніц, 8 амбулаторый, 2 паліклінікі, 24 фельч.-ак. пункты, турбаза «Высокі Бераг» (в. Мікалаеўшчына), 3 дзіцячыя аздараўленчыя летнікі, 3 базы адпачынку, дом-інтэрнат з пансіянатам для ветэранаў Вял. Айч. вайны, дом-інтэрнат для псіханеўралагічных хворых. Дзейнічаюць філіялы музеяў Я.Коласа (в. Мікалаеўшчына) і Ф.Э.Дзяржынскага (в. Пятрылавічы). Помнікі архітэктуры: царква Іаана Прадцечы (17 ст.) у в. Вішнявец, Кальвінскі збор (1590) і капліца (19 ст.) у в. Дзераўная, Петрапаўлаўскі касцёл (сярэдзіна 16 ст.) і царква Ушэсця (пач. 17 ст.) у в. Новы Свержань, Іосіфаўскі касцёл (1911) у в. Рубяжэвічы, царква Раства Багародзіцы (канец 18 ст.) у в. Стары Свержань, гіст. помнік — *Колас аўскі заказнік*. Выдаецца газ. «Прамень».

Літ.: Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі: Мінская вобл. Кн. 2. Мн., 1987.

С.А.Галоўка.

СТА́ЎКА, 1) старажытнаруская назва паходнага шатра, які ставілі старшаму военачальніку ў тым месцы, адкуль ён меркаваў кіраваць войскамі ў час бою. 2) Месца знаходжання вярх. камандавання і яго штаба; у час вайны вышэйшы орган кіраўніцтва баявымі дзеяннямі ўзбр. сіл. Гл. *Стаўка Вярхоўнага Галоўнакамандавання*, *Стаўка Вярхоўнага Галоўнакамандуючага*. 3) Вызначаны памер заработнай платы (аклад), а таксама норма вылічвання падатку і інш. 4) У азартных гульнях (картачных і інш.) — грашовая сума, якую гулец «ставіць на карту» (г.зн. укладае ў гульню). 5) У пераносным сэнсе — арыентацыя, разлік на што-н. або каго-н., у т.л. на сябе (С. на свае сілы). Гл. таксама *Вочная стаўка*.

С.В.Папоў.

СТА́ЎКА ВЯРХО́ЎНАГА ГАЛОЎНАКАМА́НДАВАННЯ (СВГК), вышэйшы надзвычайны орган стратэгічнага кіраўніцтва Узбр. Сіламі СССР у Вял. Айч. вайну. Створана ў Маскве паводле пастановы СНК і ЦК ВКП(б) ад 23.6.1941. Напачатку наз. Стаўка Гал. Камандавання (СГК). У яе склад уваходзілі С.К.Цімашэнка (старшыня), І.В.Сталін, В.М.Молатаў, С.М.Будзённы, К.Я.Варашылаў, Г.К.Жукаў, М.Г.Кузняцоў. 10.7.1941 пераўтворана ў Стаўку Вярх. Камандавання (СВК); яе ўзначаліў Сталін, у склад уведзены Б.М.Шапашнікаў. З 8.8.1941, калі Сталін быў прызначаны Вярх. Галоўнакамандуючым, Стаўка стала наз. СВГК. У ходзе вайны ў розны час у яе склад уваходзілі вядомыя паліт., дзярж. і ваен. дзеячы. 17.2.1945 пастановай Дзярж. к-та абароны вызначаны склад СВГК: Сталін (Вярх. Галоўнакамандуючы), Жукаў (нам. Вярх. Галоўнакамандуючага), А.М.Васілеўскі, А.І.Антонаў, М.А.Булганін, Кузняцоў. СВГК кіравала франтамі, флатамі і авіяцыяй далёкага дзеяння, а таксама арганізоўвала ўзаемадзеянне (каардынавала дзеянні) паміж дзеючай арміяй і партыз. фарміраваннямі (праз *Цэнтральны штаб партызанскага руху*). Асн. рабочымі органамі СВГК былі Генштаб, упраўленні нар. камісарыятаў абароны і ВМФ.

С.В.Папоў.

СТА́ЎКА ВЯРХО́ЎНАГА ГАЛОЎНАКАМА́НДУЮЧАГА (СВГ) у 1-ю сусветную вайну 1914—18, орган вышэйшага палявога кіравання і месца знаходжання галоўнакамандуючага ўзбр. сіламі Расіі. У пач. вайны размяшчалася ў Баранавічах, з 21.8.1915 — у Магілёве, з 26.2.1918 — у Арле. На чале ўзбр. сіл стаяў Вярх. галоўнакамандуючы з надзвычай шырокімі паўнамоцтвамі, яго штаб першапачаткова складаўся з 5 упраўленняў. У пач. вайны ў СВГ было 9 генералаў, 36 афіцэраў, 12 ваен. чыноўнікаў і 125 салдат. У ходзе вайны склад СВГ павялічваўся, і на 14.11.1917 у яе ўваходзілі 15 упраўленняў, 3 канцылярыі, 2 к-ты (усяго больш за 2 тыс. генералаў, афіцэраў, чыноўнікаў і салдат). Пры Стаўцы знаходзіліся і ваен. прадстаўнікі саюзных дзяржаў *Антанты*. Пасля Лют. рэвалюцыі 1917 Стаўка стала цэнтрам арганізацыі *Карнілава мяцяжу 1917*. Пасля перамогі ў Петраградзе Кастр. рэвалюцыі 1917 СВГ (Вярх. галоўнакамандуючы ген. М.М.*Духонін* і камісар Часовага ўрада В.Б.Станкевіч) 26 кастр. (8 ліст.) заклікала армію выступіць супраць сав. улады. 4—11 (17—24) ліст. прадстаўнікі кадэтаў, эсэраў, меншавікоў і інш. партый спрабавалі стварыць пры Стаўцы т.зв. агульнарас. ўрад на чале з эсэрам В.М.Чарновым. З 7(20) ліст. Духонін пры падтрымцы прадстаўнікоў Антанты адмовіўся выконваць указанні сав. ўрада і пачаць перагаворы з Германіяй аб перамір'і. 9(22) ліст. ён адхілены ад пасады і на гэтую пасаду прызначаны бальшавік прапаршчык М.В.*Крыленка*. 19 ліст. (2 снеж.) па загадзе Духоніна з турмы ў Быхаве выпушчаны генералы Л.Г.*Карнілаў*, А.І.*Дзянікін* і інш., якія ўцяклі на Дон. У гэты ж дзень Магілёўскі ВРК устанавіў кантроль над Стаўкай. 20.11(13.12).1917 СВГ занята атрадам рэв. войск на чале з Крыленкам, а Духонін забіты салдатамі. 21.11(4.12).1917 пры рэв. Стаўцы створаны ВРК (старшыня І.Ф.Баярскі), які прызначыў сваіх камісараў у аддзелы і ўпраўленні СВГ, распрацаваў дакументы аб дэмакратызацыі і дэмабілізацыі арміі. 16(29).12.1917 ВРК рэарганізаваны ў Цэнтр. к-т дзеючых армій і флоту (Цэкадорф) у складзе 50 чал. (старшыня М.У.Рагазінскі). 9.12.1918 пры Стаўцы створаны Рэв. палявы штаб — орган аператыўнага кіраўніцтва ўзбр. барацьбой з контррэвалюцыяй, пачала выдавацца газ. «Революционная ставка». У сувязі з дэмабілізацыяй арміі 5.3.1918 пасада Вярх. галоўнакамандуючага скасавана, 9.3.1918 спыніў дзейнасць Цэкадорф, 16.3.1918 — штаб Стаўкі.

Вярх. галоўнакамандуючымі былі: вял. кн. *Мікалай Мікалаевіч*, імператар *Мікалай II*, М.В.*Аляксееў*, А.А.*Брусілаў*, Карнілаў, А.Ф.*Керанскі*, Духонін, Крыленка.

І.К.Скварцоў.

СТА́ЎКА ПАДА́ТКУ, велічыня *падатку* на адзінку падаткаабкладання (га зямлі, трансп. сродкі, рубель даходу і інш.). Устанаўліваецца падатковым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь для кожнага аб'екта абкладання. Адрозніваюць С.п. цвёрдыя, прапарцыянальныя, прагрэсіўныя. Цвёрдыя С.п. ўстанаўліваюцца ў абсалютнай суме і не залежаць ад велічыні даходаў (падаткі на зямельны ўчастак, дом, каштоўныя паперы і інш.). На Беларусі, напр., у 2002 С.п. на маёмасць фіз. асобы (дом, дача, гараж) складала 0,1% ад вартасці аб'екта абкладання. Прапарцыянальныя С.п. ўстанаўліваюцца ў аднолькавым працэнце да даходу незалежна ад яго велічыні. З ростам даходу падатак прапарцыянальна павялічваецца. Прыкладам такога падаткаабкладання на Беларусі з'яўляецца падатак на прыбытак бел. устаноў (С.п. — 24%; 2002). Прагрэсіўныя С.п. павялічваюцца па меры росту абкладанага даходу. Прагрэс. стаўкі на Беларусі ўжываюцца пры спагнанні падаходнага падатку з фізічных асоб (5 ставак).

СТА́ЎКА РЭФІНАНСАВА́ННЯ, уліковая, дысконтная стаўка, працэнтная стаўка, пад якую цэнтр. банк краіны (напр., Нац. банк Рэспублікі Беларусь) выдае крэдыты камерцыйным банкам для папаўнення іх грашовых рэзерваў і крэдытавання прадпрыемстваў, камерцыйных фірм, прадпрымальнікаў. Мяняецца ў залежнасці ад попыту на крэдыты, існуючых рэсурсаў і тэмпаў інфляцыі. С.р. цэнтр. банк можа рэгуляваць узровень ліквіднасці камерцыйных банкаў, іх крэдытную актыўнасць, аб'ём грашовай масы ў краіне, а таксама валютны курс і плацежны баланс. Яна вызначае ўмовы рынку каштоўных папер, адлюстроўваецца на адносінах насельніцтва да ашчаджання і інвестыцый.

Літ.: Деньги, кредит, банки. Мн., 1997; Деньги. Кредит. Банки. Ценные бумаги: Практикум. М., 2001.

М.Маркусенка.

СТА́ЎНІНГ (Stauning) Торвальд (26.10.1873, Капенгаген — 3.5.1942), дацкі паліт. і дзярж. дзеяч. З 1896 чл., у 1910—42 старшыня *Сацыял-дэмакратычнай партыі Данії* (СДПД). У 1905—42 дэп. рыксдага, у 1910—29 (акрамя 1924—26) старшыня фракцыі СДПД у рыксдагу. У 1913, 1916—18, 1920 уваходзіў ва ўрад. У 1924—26 і 1929—42 прэм'ер-міністр Данії. Урад С. ўстанавіў дыпламат. адносіны Данії з СССР (1924), прытрымліваўся знешнепаліт. нейтралітэту, правёў шэраг сац. рэформ

(1930-я г.). У 2-ю сусв. вайну пасля акупацыі Данії герм. войскамі (крас. 1940) С. намагаўся абараняць дзярж. інтарэсы краіны.

СТАЎПІ́ШЧЫ, Стаўпішча, вёска ў Казуліцкім с/с Кіраўскага р-на Магілёўскай вобл., каля аўтадарогі Бабруйск—Магілёў. Цэнтр калгаса. За 6 км на ПдЗ ад г.п. Кіраўск, 93 км ад Магілёва, 20 км ад чыг. ст. Бярэзіна. 468 ж., 207 двароў (2001). Базавая школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Брацкія магілы сав. воінаў і партызан.

Вядома з 1560 як сяло, дзярж. ўласнасць Бабруйскага староства ВКЛ. З 1621 уладанне С.Рагозы. У 1738 у С. 27 гаспадарак. З 2-й пал. 18 ст. С. — цэнтр староства, якое было здадзена ў пажыццёвае ўладанне Ленцкаму. З-за непамерных павіннасцей, рэквізіцый і экзекуцый сяляне ў 1766 узнялі паўстанне, якое ахапіла і б.ч. вёсак суседняга Любоніцкага староства. У 1728 улады задушылі паўстанне, яго кіраўнікоў П.Лагойку, Л.Самадзелку, С.Пячонку пакаралі смерцю. З 1793 вёска ў Рас. імперыі ў Бабруйскім пав. У 1897 — 724 ж., 100 двароў, школа, 2 ветракі, 2 крупадзёркі, бровар, цагельны з-д, хлебазапасны магазін. З 1916 працавала нар. вучылішча. З 20.8.1924 у Бабруйскім 2-м, з 12.2.1935 у Кіраўскім р-нах. *В.В.Віталёва.*

СТА́ЎРАПАЛЬ, горад у Расіі, цэнтр Стаўрапольскага краю. Засн. ў 1777 як крэпасць, горад з 1785. У 1935—1943



Горад **Стаўрапаль**. Палац культуры.

меў назву Варашылаўск. 343 тыс. ж. (2000). Чыг. ст., вузел аўтадарог. Аэрапорт. Прам-сць: маш.-буд. і металаапр. (ВА станкабудаўнічае і «Кінатэхніка»; з-ды — аўтамаб. кранаў, аўтапрычэпаў, «Электрааўтаматыка», інструментальны і інш.), хім. (ВА «Анілін», з-ды хім. рэактываў і люмінафораў, тэхн. вугляроду), харч. і харчасмакавая (мясакамбінат, млынзавод, кандытарскі к-т, вінаробчыя, піваварныя, малочныя прадпрыемствы), лёгкая (гарбарна-абутковая, швейная), мэблевая, буд. матэрыялаў, паліграфічная. 4 ВНУ. 2 т-ры. Музеі: краязнаўчы, выяўл. мастацтваў, літ. і інш. Арх. помнікі 19 ст.

СТАЎРАПО́ЛЬСКАЕ ЎЗВЫ́ШША, платопадобнае ўзвышша ў Перадкаўказзі, паміж рэкамі Кума, Маныч і Кума-Манычскай упадзінай, у Стаўрапольскім краі Расіі. Пераважаюць выш. 300—600 м (найб. 831 м — г. Стрыжамент). Парэзана шырокімі далінамі рэк і ярамі на асобныя масівы. Складзена з глін, пясчанікаў і вапнякоў. Стэпы разараны; на найб. узвышаных участках — лесастэп з шыракалістымі лясамі. Часткова арашаецца пры дапамозе Кубана-Егарлыкскай сістэмы і Вял. Стаўрапольскага канала.

СТАЎРАПО́ЛЬСКАЯ ПАРО́ДА авечак, танкарунная парода воўнавага кірунку. Выведзена ў 1923—50 у Стаўрапольскім краі (Расія) скрыжаваннем



Баран **стаўрапольскай пароды**.

новакаўказскіх мерыносаў з баранамі *рамбулье* і грозненскай пароды. Выкарыстоўваюць для паляпшэння воўнавай прадукцыйнасці танкарунных парод. Пашырана на Пд Расіі.

Жывёлы моцнай сухой канстытуцыі. Маса бараноў 100—115 (да 150), матак 50—55 кг. На ніжняй ч. шыі скурныя складкі ў выглядзе бурды ці фартуха. Высокая воўнавая прадукцыйнасць. Воўна даўж. 8—10 см, густая, трывалая, добра ўраўнаваная, мяккая, з шаўкавістым бляскам. Настрыг з бараноў 14—19, з матак 6—7 кг. Выхад чыстай воўны 40—47%. Пладавітасць 120—140 ягнят на 100 матак.

СТАЎРАПО́ЛЬСКІ КРАЙ. Размешчаны на Пд еўрап. ч. Рас. Федэрацыі, у цэнтры Перадкаўказзя, каля паўн. схілаў Вял. Каўказа. Утвораны 13.2.1924 як Паўд.-Усх. вобл. (край), з 16.10.1924 — Паўн.-Каўказскі край, з 13.3.1937 — Арджанікідзеўскі край, з 12.1.1943 — сучасная назва. Пл. 66,5 тыс. км². Нас. 2660,7 тыс. чал. (2000), гарадская 54,1%. Жывуць рускія (84%), армяне (2,9%), украінцы (2,6%) і інш. Цэнтр — г. *Стаўрапаль*. Найб. гарады: Пяцігорск, Нявіннамыск, Кіславодск, Есентукі, Георгіеўск, Мінеральныя Воды, Будзёнаўск.

Прырода. Рэльеф С.к. зменьваецца ад раўнінага на Пн і ПнУ да перадгорнага і горнага на Пд і ПдЗ. Цэнтр. ч. занята *Стаўрапольскім узвышшам*. На У узвышша пераходзіць у Церска-Кумскую нізіну (ч. Прыкаспійскай нізіны), на ПнУ Кума-Манычская ўпадзіна, на ПдЗ схілы Вял. Каўказа. У паласе перадгор'яў вылучаецца раён Каўказскіх Мінеральных Вод з гарамі-лакалітамі выш. да 1401 м (г. Бештау). Карысныя выкапні: прыродны газ (запасы 55 млрд. м³), нафта (234 млн. т), медзь, поліметалы, уранавыя руды, вугаль, мінер. буд. матэрыялы (гіпс, даламіты, гліны, ракушачнік і інш.). Больш за 130 крыніц мінер. вод. Клімат кантынентальны. Лета гарачае і засушлівае, зіма мяккая. Сярэдняя т-ра ліп. 22—25 °С (у гарах 14 °С), студз. -5 °С (у гарах да -10 °С). Ападкаў на раўніне 300—350 мм за год, у перадгор'ях больш за 600 мм. Найб. рэкі: Кубань, Кума, Калаус, Егарлык. Азёры: Тамбуканскае (з запасамі лекавай гразі), частка воз. Маныч-Гудзіла, Цаган-Хак, Салёнае і інш. Вадасх. Краснае, Егарлыкскае і інш. Глебы чарназёмныя, каштанавыя, алювіяльныя, на горных схілах горна-лясныя, горналугавыя, на У і ПнУ бурыя з саланцамі і саланчакамі. Большая ч. С.к. ў стэпавай і паўпустыннай прыродных зонах. Пад лесам (бук, дуб, граб, елка, піхта) каля 4%, пераважна ў гарах. Стэпы з разнатраўна-кавыльнай (на ПнЗ) і палынава-ціпчакова-кавыльнай (ПнУ і У) расліннасцю, на крайнім У паўпустыні са злакава-палынавай і палынавай расліннасцю.

Гаспадарка. С.к. — рэгіён са шматгаліновым індустр.-агр.-рэкрэацыйным комплексам. Сярод розных га-



лін прам-сці вылучаюцца харч., хім., маш.-буд. і металаапр., паліўная, буд. матэрыялаў, лёгкая, электраэнергетыка. Харч. прам-сць (21,9% кошту прамысл. прадукцыі) грунтуецца на магутнай базе с.-г. сыравіны. Развіты мясная і мясаканцервавая, масласыраробная, піваварная, тытунёвая, вінаробная, рыбная, кансервавая, мукамольна-крупяная і інш.). Вытв-сць мінер. вод «Есентукі», «Нарзан», «Нагуцкая». Хім. прам-сць (мінер. ўгнаенні, сінт. смолы, пластмасы, тэхн. вуглярод, прадукцыя быт. хіміі), маш.-буд. і металаапр. (станкі, інструменты, тэхналагічная аснастка, с.-г. машыны, аўтапрычэпы, электратэхн. вырабы, кінатэхніка, халадзільнае абсталяванне, паўправадніковая тэхніка), лёгкая (ваўнамыйная, тэкст., абутко-

вая), вытв-сць буд. матэрыялаў. Здабыча прыроднага газу (330 млн. м^3, 1999) і нафты (908 тыс. т). Вытв-сць электраэнергіі 17,7 млрд. кВт·гадз (1999). Стаўрапольская і Нявіннамыская ДРЭС, Егарлыкская і Кубанская ГЭС. С.к. — важны с.-г. рэгіён Расіі. Пл. с.-г. угоддзяў 5,4 млн. га, у т.л. пад ворнымі землямі 3,9 млн. га. Пасевы азімай пшаніцы (1,2 млн. га), цукр. буракоў, сланечніку, кукурузы, грэчкі, гарчыцы, рапсу; на арашальных землях — рыс, на засушлівых — проса. Агародніцтва, бульбаводства. Збор (тыс. т, 1999): збожжа — 3293 (2-е месца ў Расіі), сланечніку — 277,5, цукр. буракоў — 512,3, бульбы — 351,2. Вінаградарства, садоўніцтва, бахчаводства. Гадуюць (тыс. галоў) буйн. раг. жывёлу (446), свіней (510), авечак (1425). Птушкагадоўля. Пчалярства. Рыбаводства. Вытв-сць воўны (1999) 7168 т (2-е месца ў Расіі). Танкарунная племянная авечкагадоўля. Арашэнне зямель і абвадненне пашы (Вял. Стаўрапольскі, Нявіннамыскі, Кума-Манычскі і інш. каналы). Даўж. чыгункі 944 км, аўтадарог з цвёрдым пакрыццём 7447 км. Асн. чыгункі Нявіннамыск—Мінеральныя Воды—Пяцігорск, Пяцігорск—Есентукі—Кіславодск, аўтадарогі Георгіеўск—Мінеральныя Воды—Нявіннамыск, Мінеральныя Воды—Пяцігорск—Есентукі—Кіславодск і інш. Газаправоды ў Маскву, С.-Пецярбург. Курорты: *Каўказскія Мінеральныя Воды*, Кумагорск. *В.М.Корзун.*

СТАЎРО́Ў Аляксандр Апанасавіч (н. 5.7.1949, в. Асаўнік Кіраўскага р-на Магілёўскай вобл.), бел. фізік. Д-р фіз.-матэм. н. (1999). Скончыў БДУ (1971). З 1971 у Ін-це фізікі Нац. АН Беларусі. З 1979 у акц. т-ве «Пеленг». Навук. працы па лазернай дыягностыцы плазмы, фізіцы цвердацельных лазераў, лазернай лакацыі, оптыка-электронных і лазерных інфарм. сістэмах. Распрацаваў метады аптымальнай рэалізацыі оптыкалакацыйных сістэм для вызначэння параметраў руху аэрадынамічных і балістычных аб'ектаў.

Тв.: Твердотельные лазеры импульсно-периодического действия для дистанционного зондирования в ближней ИК области спектра. Мн., 1998; Метрологические особенности оптико-локационных систем с лазерным информационным каналом. Мн., 1998.

М.П.Савік.

СТАЎРО́Ў Васіль Пятровіч (н. 1.9.1940, г. Кушва Свярдлоўскай вобл., Расія), бел. вучоны ў галіне механікі кампазіцыйных матэрыялаў. Д-р тэхн. н. (1981), праф. (1984). Скончыў Чэлябінскі політэхн. ін-т (1962). З 1970 у Гомельскім ун-це (заг. кафедры), з 1981 рэктар Гомельскага політэхн. ін-та. У 1985—91 першы нам. міністра вышэйшай і сярэдняй спец. адукацыі, у 1994—96 — міністра адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь і старшыня К-та па навуцы і тэхналогіях. У 1991—94 і з 1997 у Бел. тэхнал. ун-це (заг. кафедры). Навук. працы па статыст. механіцы кампазіцыйных матэрыялаў, тэорыі пултрузійнай тэхналогіі (метад працяжкі) вытв-сці палімерных валакністых кампазітаў, распрацоўцы метадаў кіравання працэсамі формаўтварэння вырабаў з іх.

Тв.: Механика композиционных материалов. Мн., 1996; Конструирование и расчет изделий из композиционных материалов. Мн., 1999.

М.П.Савік.

СТАЎРЫ́ДЫ (Trachurus), род рыб сям. стаўрыдавых атр. акунепадобных. 12 відаў. Пашыраны пераважна ў субтрапічных і ўмераных водах Атлант. і Ціхага ак., прылеглых морах. Найб. вядомыя С.: звычайная, або еўрап. міжземнаморска-атл. (T. trachurus), і міжземнаморская (T. mediterraneus).

Даўж. да 70 см, маса да 2,9 кг. Цела верацёнападобнае, сціснутае з бакоў. На вачах тлушчавыя павекі. Луска дробная, цыклоідная. Галава зверху і з бакоў укрыта луской. На бакавой лініі касцявыя шчыткі. Перад анальным плаўніком 2 калючкі. Кормяцца дробнай рыбай і ракападобнымі. Аб'ект промыслу.



Стаўрыды: 1 — звычайная; 2 — міжземнаморская.

СТАФ (Staff) Леапольд (14.11.1878, г. Львоў, Украіна —31.5.1957), польскі паэт, перакладчык. Скончыў Львоўскі ун-т (1901). У першым зб. «Сны пра магутнасць» (1901) працягваў сімвалісцкія пошукі «*Маладой Польшчы*», выступіў супраць дэкаданса. У зб-ках «Квітнеючая галінка» (1908), «Усмешкі імгненняў» (1910) і інш. цікавасць да культуры антычнасці і Адраджэння, апяваңне вечных этычных і эстэт. каштоўнасцей; у зб. «Вясёлка са слёз і крыві» (1918) грамадз. лірыка. Лірычныя зб-кі «Высокія дрэвы» (1932), «Колер мёду» (1936), «Мёртвае надвор'е» (1946), «Вербалозы» (1954), «Дзевяць муз» (выд. 1958) адметныя пошукамі ўзвышанага ў паўсядзённасці, імкненнем да прастаты і гармоніі ў выяўленні агульначалавечых пачуццяў. Пераклаў некат. творы ант., ням. і франц. аўтараў. На бел. мову яго асобныя творы пераклалі С.Дзяргай, М.Машара, А.Мінкін, М.Танк. Дзярж. прэмія Польшчы 1927, 1937, 1951, 1955.

Тв.: Бел. пер. — [Вершы] // Далягляды, 1990. Мн., 1990; У кн.: На зорных шляхах. Мн., 1991; Высокія дрэвы. Мн., 1994; Рус. пер. — Стихи. М., 1973.

Літ.: Wyka M. Leopold Staff. Warszawa, 1985.

СТАФА́Н БАТО́РЫЙ, Сцяпан Батура (венг. Istwan Bathory, польск. Stefan Batory; 27.9.1533, Шомліо, цяпер Румынія — 12.12.1586), дзяржаўны дзеяч, палкаводзец, трансільванскі князь [1571—86] , вял. князь ВКЛ і кароль польскі [1576—86]. Паходзіў са стараж. венгерскага роду Баторыяў Шомліо. З 15 гадоў на ваен. службе ў караля Чэхіі і Венгрыі Фердынанда I. Пазней служыў у трансільванскага князя Яноша Жыгманда Запальяі (Іаана Сігізмунда Запольскага). Пасля смерці Яноша Жыгманда (1571) князь Трансільваніі. Пасля таго, як прэтэндэнт на каралеўскі трон Рэчы Паспалітай *Генрык Валезы* ўцёк з Кракава (1574), С.Б. пры дапамозе магнатаў Збароўскіх і інш. выставіў сваю кандыдатуру на трон Рэчы Паспалітай. На элекцыйным сойме 15.12.1575 насуперак сенату, які абвясціў каралём Максіміляна II, дробная



Стафан Баторый.

шляхта абвясціла С.Б. каралём Рэчы Паспалітай. Каранаваўся ў Кракаве 1.5.1576. Пасля доўгіх перагавораў з прадстаўнікамі ВКЛ і пасля таго, як граматай ад 29.7.1576 прызнаў, што Польшча і ВКЛ з'яўляюцца раўнапраўнымі дзяржавамі ў складзе федэратыўнай дзяржавы, абавязаўся захоўваць самастойнасць ВКЛ, пашыраць яго межы,

не прызначаць военачальнікамі ў ВКЛ палякаў, агульныя соймы склікаць па чарзе то ў Кароне (Польшча), то ў Княстве (ВКЛ), С.Б. быў абвешчаны вял. князем ВКЛ. У далейшым кожны трэці сойм Рэчы Паспалітай адбываўся ў Гродне. У 1579—82 удзельнічаў у Лівонскай вайне. У выніку шэрагу паспяховых аперацый вярнуў ВКЛ Полацк і Вялікія Лукі. Аблога Пскова скончылася безвынікова, аднак паскорыла заключэнне 10-гадовага *Ям-Запольскага мірнага дагавора 1582* і заканчэнне вайны. Імкнуўся да ўмацавання каралеўскай улады, разам з тым падтрымліваў шляхту. Замест каралеўскага суда зацвердзіў для яе ў якасці вышэйшай суд. інстанцыі шляхецкія выбарныя трыбуналы (для шляхты Польшчы ў 1578, для шляхты Літвы і Беларусі ў 1581). У 1584 афіцыйна абяцаў зацвердзіць папраўкі да *Статута Вялікага княства Літоўскага 1566*. Прывілеем ад 1.4.1579 пераўтварыў Віленскі езуіцкі калегіум у акадэмію (пазней — Віленскі універсітэт), даў дазвол на заснаванне езуіцкіх калегіумаў у Полацку (1581), Рызе (1580), Дэрпце (Тарту, 1584). Імкнуўся да мірнага вырашэння ідэалагічных канфліктаў. Сваю рэзідэнцыю трымаў у Гродне. Тут прымаў пасольствы рускае (1581) і англійскае (1584), правёў раду сенатараў для разгляду дамаганняў Швецыі (1582). Памёр у Гродне.

А.П.Госцеў.

СТАФА́НІК Васіль Сямёнавіч (14.5.1871, с. Русаў Снятынскага р-на Івана-Франкоўскай вобл., Украіна — 7.12.1936), украінскі пісьменнік. Вучыўся ў Кракаўскім ун-це (1892—1900). Друкаваўся з 1897. Майстар псіхал. навелы: зб-кі «Сіняя кніжачка» (1899), «Каменны крыж» (1900), «Дарога» (1901), «Маё слова» (1905), у якіх адлюстраваў жыццё і побыт зах.-ўкр. сялянства. У зб-ках «Ваенныя страты», «Morituri» (абодва 1925), «Зямля» (1926), «Дурныя бабы» (1928), «У нас усё свята» (1933) паказаў антынар. сутнасць імперыялістычнай вайны, абуджэнне нац. самасвядомасці, пратэст супраць прыгнёту. Паводле навел С. зняты маст. фільм «Каменны крыж» (1968). На бел. мову асобныя творы С. пераклалі М.Багдановіч, Р.Зямкевіч, Я.Саламевіч, К.Чорны.

Тв.: Твори. Київ, 1964; Бел. пер. — [Навелы] // Полымя. 1971. № 5;Рус. пер. — Избранное. М., 1971.

Літ.: Лесин В.М. Василь Стефаник — майстер новели. Київ, 1970.

СТАФАНО́ВІЧЫ, бел. музыканты 19 ст., браты. Дамінік Рыгоравіч (Восіпавіч; 21.5.1797 — каля 1870), піяніст, педагог, дырыжор. У 1820—37 кіраўнік *Мінскага гарадскога аркестра*, у 1848—65 выкладаў музыку і хар. спевы ў Мінскай гімназіі і прыватным узорным жаночым пансіёне, адначасова з 1856 наладжваў сімф. канцэрты. Сярод вучняў С.*Манюшка*, К.*Марцінкевіч*, Ф.*Міладоўскі*. Вікенцій Рыгоравіч (16.8.1804—?), дырыжор, педагог. У 1837—62 і ў 1869 кіраўнік Мінскага гар. аркестра, пры ім арганізаваў муз. школу для сірот і дзяцей беднякоў, дзе навучаў іх ігры на розных інструментах. Удзельнічаў у паст. аперэт «Рэкруцкі набор» (1841) і «Сялянка» («Ідылія», 1852) Манюшкі і К.Кжыжаноўскага на лібрэта В.Дуніна-Марцінкевіча.

Літ.: Кісялёў Г. Настаўнік Станіслава Манюшкі // Кісялёў Г. Героі і музы. Мн., 1982; Ахвердова Е.И. Из истории фортепианного искусства Белоруссии XIX в. // Вопросы культуры и искусства Белоруссии. Мн., 1984. Вып. 3; Яе ж. Пачынальнікі беларускага піянізму // Мастацтва Беларусі. 1985. № 2; Коротеев А.Л. Из истории духовых оркестров Белоруссии XIX в. // Вопросы культуры и искусства Белоруссии. Мн., 1986. Вып. 5.

А.І.Ахвердава.

СТАФАНО́ЎСКІ Пётр Міхайлавіч (2.1.1903, в. Чыркавічы Светлагорскага р-на Гомельскай вобл. — 23.2.1976), генерал-маёр (1944), Герой Сав. Саюза (1948). Скончыў Ленінградскую ваенна-тэарэт. школу ВПС (1927), Качынскую ваенна-авіяц. школу лётчыкаў (1928). У Чырв. Арміі з 1925. З 1928 лётчык-інструктар, выпрабавальнік, камандзір



П.М.**Стафаноўскі**.

звяна, атрада. У Вял. Айч. вайну з 1941 на фронце, камандзір знішчальнага авіяпалка, нам. камандзіра авіякорпуса, нач. Зах. сектара ППА Масквы. З 1942 на лётна-выпрабавальнай рабоце. Пасля вайны правёў 238 выпрабаванняў самалётаў розных тыпаў, зрабіў 16 першых вылетаў на новых відах самалётаў, першы ў свеце выканаў вышэйшы пілатаж на рэактыўным самалёце. Да 1954 у Сав. Арміі. Аўтар кнігі «Трыста невядомых» (2-е выд., 1973) і інш.

СТА́ФАРД (Stafford) Томас (н. 17.9.1930, г. Уэтэрфард, штат Аклахома, ЗША), касманаўт ЗША. Ген.-лейт. ВПС (у адстаўцы). Скончыў ваен.-марскую акадэмію ЗША (1952), школу лётчыкаў-выпрабавальнікаў (1959). З 1962 у атрадзе касманаўтаў НАСА. 15—16.12.1965 з У.*Шырам* здзейсніў палёт на касм. караблі (КК) «Джэміні-6» (як 2-і пілот); 3—6.6.1966 з Ю.*Сернанам* — на КК «Джэміні-9» (як камандзір); 18—26.5.1969 з Дж.*Янгам* і Сернанам — на КК «Апалон-10» аблёт Месяца з выхадам на арбіту яго штучнага спадарожніка; 15—25.7.1975 з В.*Брандам* і Д.*Слейтанам* — на КК «Апалон» па праграме «*ЭПАС*». У космасе правёў 21,2 сут. Залаты медаль НАСА «За выдатныя заслугі». Залатыя медалі «Космас» (ФАІ, 2).

У.С.Ларыёнаў.

СТАФІЛАКО́КІ (Staphylococcus), род бактэрый сям. мікракокавых. 3 віды. Пашыраны ў паветры, глебе, вадзе, на скуры і слізістых абалонках цеплакроўных жывёл і чалавека. Сапрафітныя, умоўна патагенныя і патагенныя віды.

Клеткі сферычнай формы, нерухомыя. Пры дзяленні ўтвараюць скопішчы накшталт гронак вінаграду, размяшчаюцца таксама пасобку або парамі. Грамстаноўчыя. Факультатыўныя анаэробы. Хемаарганатрофы. Патагенныя С. прадуцыруюць экза- і эндатаксіны, алергізуючыя рэчывы; узбуджальнікі гнойна-запаленчых захворванняў.

А.І.Ерашоў.

СТАФІЛЕ́Я, род кветкавых раслін, тое, што *клякачка*.

СТАФІЛІ́НЫ, стафілініды, каротканадкрылыя (Staphilinidae), сямейства жукоў падатр. разнаедных. Больш за 30 тыс. відаў. Пашыраны паўсюдна, акрамя Антарктыды. Жывуць у глебе, подсціле, гнаі, расл. і жывёльных рэштках, у грыбах, мурашніках, гнёздах птушак, норах млекакормячых, на кветках, пад карой дрэў і інш. На Беларусі каля 700 відаў. У Чырв. кнізе 2 віды: С. валасаты (Emus hirtus) і С. пахучы (Ocypus olens).

Даўж. да 40 мм. Цела вузкае, прадаўгаватае, чорнае, карычневае, аранжава-чырв., жоўтае і інш. Галава вял., з буйнымі сківіцамі, можа ўцягвацца ў пярэднягрудзі. Вусікі пераважна 11-членікавыя. Надкрылы ўкарочаныя (адсюль другая назва). Крылы часта даўжэйшыя за цела. Ногі бегальныя. Лічынкі падобныя на дарослых асобін, з кароткімі нагамі, на канцы брушка членістыя прыдаткі — цэркі. Большасць С. — драпежнікі і сапрафагі. Некат. віды С. выкарыстоўваюць для барацьбы са шкоднікамі раслін.

Літ.: Кершенблат Я.Д. Сем. Staphylinidae — стафилины, или коротконадкрылые жуки // Определитель насекомых Европейской части СССР. Т. 2. Жесткокрылые и веерокрылые. М.; Л., 1965; Тихомирова



Стафіліны: 1 — валасаты; 2 — пахучы; 3 — чырванакрылы; 4 — галакрыл чырвананогі; 5 — сінякрыл берагавы.

А.Л. Морфоэкологические особенности и филогенез стафилинид. М., 1973. *С.А.Максімава.*

СТАФЮ́К Марыя Юр'еўна (н. 16.7.1948, в. Ражнёў Косаўскага р-на Івана-Франкоўскай вобл., Украіна), украінская спявачка (лірыка-каларатурнае сапрана). Нар. арт. СССР (1985). Скончыла Кіеўскую кансерваторыю (1973). З 1972 салістка Укр. т-ра оперы і балета. Сярод партый: Марыльца («Тарас Бульба» М.Лысенкі), Новая русалка («На русалчын вялікдзень» М.Леантовіча), Мілуша («Яраслаў Мудры» Г.Майбарады), Парася («Сарочынскі кірмаш» М.Мусаргскага), Антаніда («Іван Сусанін» М.Глінкі), Віялета, Джыльда («Травіята», «Рыгалета» Дж.Вердзі) і інш. Дзярж. прэмія Украіны імя Т.Шаўчэнкі 1988.

СТА́ХАВА, вёска ў Плотніцкім с/с Столінскага р-на Брэсцкай вобл. Цэнтр калгаса. За 27 км на ПнЗ ад г. Столін, 248 км ад Брэста, 6 км ад чыг. ст. Прыпяць. 1162 ж., 470 двароў (2001). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Помнік архітэктуры — Свята-Пакроўская царква (1857).

СТАХА́НАЎ, горад у Луганскай вобл. Украіны. Засн. ў сярэдзіне 19 ст. як цэнтр здабычы каменнага вугалю. Горад з 1932. Да 1937 і ў 1940—78 наз. Кадзіеўка. Перайменаваны ў гонар А.Р.Стаханава. Каля 150 тыс. ж. (2001). Чыг. ст., вузел аўтадарог. Здабыча каменнага вугалю. Прам-сць: чорная металургія (вытв-сць ферасплаваў, коксахімія), маш.-буд. (маставыя краны, эскалатары, вагоны, гідраабсталяванне), хімічная. Музей гісторыі горада.

СТАХА́НАЎСКІ РУХ, масавы рух навататараў і перадавікоў вытв-сці ў СССР у сярэдзіне 1930-х — пач. 40-х г. за павышэнне прадукцыйнасці працы і лепшае выкарыстанне тэхнікі. Узнік у гады 2-й пяцігодкі ў вугальнай прам-сці Данбаса, названы ў гонар зачынальніка — забойшчыка шахты «Цэнтральная—Ірміна» ў г. Кадзіеўка (цяпер Стаханаў, Украіна) А.Р.Стаханава (1905—77), які 31 жн. 1935 здолеў за змену пры норме ў 7 т здабыць 102 т вугалю, а 19 вер. — 227 т. Пры падтрымцы парт. і камсамольскіх органаў С.р. ахапіў усе галіны нар. гаспадаркі і паўплываў на значны рост прадукцыйнасці працы, на паляпшэнне яе якасных паказчыкаў. Стаханаўскія метады працы ў прам-сці і сельскай гаспадарцы ў гады Вял. Айч. вайны спрыялі перамозе сав. народа над фаш. Германіяй.

На Беларусі С.р. у ліку першых падтрымалі рабочыя-машынабудаўнікі Мінска, Гомеля, Віцебска (С.Шабалтас, В.Сямёнаў, П.Карбановіч, А.Хаткоўскі, К.Галаўня, Н.Лапін, А.Бальшакоў, І.Кучарэнка). Іх высокі прафесіяналізм, энтузіязм і адказнасць спрыялі перавыкананню норм выпрацоўкі ў некалькі разоў. У 1936 разгарнуўся рух за рост прадукцыйнасці працы, высокую культуру вытв-сці, замену існуючых норм выпрацоўкі больш высокімі, у 1939 — за шматстаночнае абслугоўванне і сумяшчэнне прафесій. Да пач. 1941 стахановцамі і ўдарнікамі ў БССР сталі 50% рабочых. У гады Вял. Айч. вайны на эвакуіраваных ва ўсх. раёны СССР бел. фабрыках і заводах, як і на інш. сав. прадпрыемствах, да раней засвоеных метадаў наватарскай працы дадаліся: хуткасная тэхналогія вытв-сці і буд-ва, рух за выкананне норм выпрацоўкі на 200 і нават 1000%, франтавыя брыгады. Вопыт і традыцыі С.р. дзейнічалі і ў пасляваен. дзесяцігоддзі, калі паступова былі заменены інш. формамі сацыялісп. спаборніцтва.

С.р. не пазбег кампанейскага характару і фармалізму. Калі напачатку ён развіваўся дзякуючы энтузіястам-наватарам, то ў далейшым яго фактычна ў абавязковым парадку навязвалі рабочым калектывам парт., камсамольскія і прафс. органы, што надавала руху ў значнай ступені фармальны характар. Адначасова С.р. паслужыў «абгрунтаваннем» павышэння норм выпрацоўкі. Недастатковая залежнасць матэрыяльнага становішча работніка і калектыву ад колькасці і якасці працы ва ўмовах адм.-камандпай эканомікі не стымулявала наватарскія пошукі для павышэння прадукцыйнасці працы.

Літ.: Козлов В.А., Хлевнюк О.В. Стахановское движение: время и люди. М., 1984; Очерки истории Беларуси, 1917—2000. Мн., 2000. *М.Г.Жаркоў.*

СТАХАСТЫ́ЧНЫ ПРАЦЭ́С, тое, што *выпадковы працэс*.

СТАХІБОТРЫЯТАКСІКО́З, хвароба сельскагаспадарчых жывёл і птушак, выкліканая атрутным плесневым грыбам стахіботрысам. Жывёлы заражаюцца пры ўжыванні папсаваных грыбам кармоў, таксама пры выпасе на ржышчы, выкарыстанні папсаванага грыбам подсцілу. Прыкметы: парушэнне мінер. абмену, язвы і трэшчыны губ, ацёкі морды жывёл, рыніты і інш. Хвароба ўскладняецца сепсісам. Гл. таксама *Кармавыя атручэнні*.

СТАХО́ВІЧ Алег Аляксандравіч (н. 21.1.1934, в. Горкі-Абчак Мінскага р-на), бел. архітэктар. Сын А.*Стаховіча*. Скончыў БПІ (1959). Працаваў у Маст. фондзе Беларусі пры Бел. саюзе мастакоў (да 1990). Кіраўнік уласнай творчай майстэрні. Асн. работы (у аўтарскім калектыве): *Курган Славы Савецкай Арміі — вызваліцельніцы Беларусі* (Дзярж. прэмія Беларусі 1970), гал. ўваход у выглядзе зоркі ў мемар. комплексе *Брэсцкая крэпасць-герой*. Аўтар арх.-скульпт. кампазіцыі «Гадзіннік» на тэр. з-да «Палімір» у г. Наваполацк Віцебскай вобл., інтэр'ераў заводскага Палаца культуры (1980-я г.).

СТАХО́ВІЧ Алесь (Аляксандр Іосіфавіч; 3.7.1907, в. Кашына Аршанскага р-на Віцебскай вобл. — 7.2.1956), бел. пісьменнік. Быў на камсамольскай і парт. рабоце. З 1938 у час. «Полымя рэвалюцыі». Друкаваўся з 1928. Аўтар кніг аповесцей і апавяданняў «Неспакойны гарадок» (1946), «Аповесці і апавяданні» (1952). Аповесці «Пампей Шчупак» (1940) пра калгасную вёску, «Шумяць лясы» (1944) пра партыз. барацьбу на Беларусі ў Вял. Айч. вайну. Раманы «Пад мірным небам» (1947—49) і «Шырокія гарызонты» (1952) пра бел. вёску першых пасляваен. гадоў. Пісаў для дзяцей: зб-кі апавяданняў «Маленькія героі» (1939), «Залаты карп» (1951). На бел. мову пераклаў «Аповесць аб сапраўдным чалавеку» Б.Палявога і інш.

Тв.: Выбр. творы. Мн., 1947; Залаты карп. Мн., 1973.

СТА́ЦЫЯ (ад лац. statio стаянне, месцазнаходжанне), феадальная павіннасць сялян і мяшчан ВКЛ на ўтрыманне вял. князя і яго світы ў час выканання ім судова-адм. функцый на месцах. Вядома з канца 14 ст., паходзіла ад стараж.-рус. *палюддзя*. У час знаходжання вял. князя ў валасцях яму дастаўлялася С. натурай — ялавічына, бараніна, свініна, свойская птушка, авёс, сена, мёд, піва і інш. Пазней С. аформілася як пастаянны збор прадуктаў, незалежна ад прыездаў вял. князя (у Віленскім і Троцкім ваяв. у пач. 16 ст.), пасля яна пераводзілася на грошы. «*Устава на валокі*» 1557 канчаткова вызначала памеры С. з сялян: 1 ялавіца і 2 бараны з 30 валок, 1 курыца і 30 яек, або 2,5 гроша з валокі. У падняпроўскіх і падзвінскіх валасцях С. для гарадоў была адменена, а ў вёсках заменена інш. зборамі. Мясц. назвы С. — ялаўшчына, вепраўшчына, баўкуноўшчына, каняўшчына, мезлева, спіжа, паборы.

СТА́ЦЫЯ, тэрыторыя, якая характарызуецца экалагічнымі ўмовамі (рэльеф, клімат, корм, укрыцці і інш.), неабходнымі для існавання пэўнага віду жывёл. Паняцце «С.» часцей ужываецца ў адносінах да наземных жывёл і толькі для віду.

Характэрныя для віду С. размеркаваны мазаічна ў межах відавога *арэала* (арэал не засяляецца цалкам). С. наз. таксама ўчасткі, у якіх ажыццяўляюцца спецыфічныя формы дзейнасці віду (С. кармавыя, гнездавыя, начлегаў і інш.). Від звычайна валодае наборам С., якія маюць рознае значэнне для жывёл, што забяспечвае лепшае выжыванне віду ў розныя сезоны года.

СТАЦЫЯНА́Р (франц. stationnaire ад лац. stationarius нерухомы), 1) у шырокім сэнсе — любая пастаянная ўстанова (тэатр, бібліятэка) у адрозненне ад часовай, перасовачнай. 2) Лячэбная ўстанова, якая мае пастаянныя ложкі для хворых; бальніца. 3) Дзённае аддзяленне ў ВНУ у адрозненне ад вячэрняга і завочнага.

СТАЦЫЯНА́РНЫ ВЫПАДКО́ВЫ ПРАЦЭ́С, працэс, імавернасныя характарыстыкі якога застаюцца нязменнымі на працягу часу назіранняў; асобны клас *выпадковых працэсаў*. Набліжана апісвае многія рэальныя працэсы, якія маюць неўпарадкаваныя флуктуацыі,

напр., пульсацыі сілы току ці напружання ў эл. ланцугу (эл. шум) можна разглядаць як С.в.п., калі гэты ланцуг знаходзіцца ў стацыянарным рэжыме (усе яго макраскапічныя характарыстыкі і ўмовы, што выклікалі працяканне току, не змяняюцца ў часе).

СТАЦЫЯНА́РНЫ СТАН у фізіцы, стан фіз. сістэмы, пры якім значэнні асн. яе характарыстык (*параметраў стану*) не мяняюцца з цягам часу. Напр., вагальная сістэма знаходзіцца ў С.с., калі амплітуда і частата ваганняў застаюцца пастаяннымі. С.с. квантава-механічнай сістэмы характарызуецца пастаянным значэннем яе энергіі, адкрытай тэрмадынамічнай сістэмы — пастаянствам скарасцей хім. рэакцый, пераносу рэчыва і энергіі, а таксама мінім. прыростам *энтрапіі*. Стан сістэмы наз. квазістацыянарным, калі велічыні, пры пастаянстве якіх ён быў бы стацыянарным, павольна мяняюцца; пры гэтым суадносіны паміж рознымі параметрамі сістэмы застаюцца прыблізна такімі ж, як і ў С.с.

СТА́ЧКА, гл. ў арт. *Забастоўка*.

СТАША́ЙЦЕНЕ (Stašaitienė) Валянціна Пранаўна (26.12.1911, г. Самара, Расія — 1.2.1990), літоўскі мовазнавец. Д-р філал. н. (1976), праф. (1978). Скончыла Вільнюскія ун-т (1942) і пед. ін-т (1955). З 1947 выкладчык Літоўскай с.-г. акадэміі, Вільнюскага ун-та, з 1976 Каўнаскага політэхн. ін-та. Даследавала пытанні лексікалогіі, лексікаграфіі, тэорыі перакладу, методыкі выкладання моў. Распрацоўвала праблемы гіст. лексікалогіі бел. мовы: «Лексіка Літоўскай метрыкі (кніг судовых спраў)» (1965), «Абстрактная лексіка на матэрыяле старабеларускіх пісьмовых помнікаў XV—XVII стст.» (1973). Аўтар «Руска-літоўскага размоўніка» (1961), складальнік «Рускалітоўскага фразеалагічнага слоўніка» (з І.Паўлаўскасам, 1985). *Р.С.Гамзовіч.*

СТА́ШАК Мікалай Іванавіч (1.5.1914, хутар Марынаўскі Адэскай вобл., Украіна — 17.2.1991), удзельнік баёў на Беларусі ў Вял. Айч. вайну, Герой Сав. Саюза (1943), ген.-лейт. (1968). Канд. ваен. навук (1961). Скончыў вучылішча пагранвойск НКУС (1938), ваен. акадэміі імя Фрунзе (1947) і Генштаба (1952). У Чырв. Арміі з 1935. У Вял. Айч. вайну з 1942 на Бранскім і Цэнтр. франтах. Полк на чале з падпалкоўнікам С. вызначыўся восенню 1943 пры вызваленні Камарынскага р-на Гомельскай вобл., калі пасля фарсіравання Дзясны, Дняпра і Прыпяці захопліваў і пашыраў плацдармы, вызваліў г.п. Камарын. Да 1973 у Сав. Арміі.

СТАШКЕ́ВІЧ Мікалай Сцяфанавіч (н. 23.8.1938, в. Мокрае Быхаўскага р-на Магілёўскай вобл.), бел. гісторык. Д-р гіст. н. (1990), праф. (1994). Скончыў БДУ (1967). З 1967 у Ін-це гісторыі партыі пры ЦК КПБ (з 1990 Ін-т гіст.-паліт. даследаванняў): з 1976 заг. сектараў гісторыі Вял. Айч. вайны, гісторыі партыі, аддзела гісторыі паліт. партый сацыяліст. арыентацыі. З 1992 у Бел. н.-д. цэнтры дакументацыі і рэтраінфармацыі, заг. кафедры гісторыі і беларусазнаўства Рэсп. ін-та вышэйшай школы БДУ. З ліст. 1999 в.а. дырэктара Ін-та гісторыі Нац. АН Беларусі. Даследуе пытанні гісторыі бел. нац.-вызв. руху, фарміравання класаў, паліт. партый і грамадскіх рухаў на Беларусі ў 19—20 ст., станаўлення і развіцця бел. дзяржаўнасці ў 20 ст., сац.-класавых адносін



М.С.**Сташкевіч**.



В.П.**Сташэўскі**.

у сав. час. Адзін з аўтараў калектыўных прац «Бальшавікі Беларусі ў барацьбе за перамогу Кастрычніка», «Дары данайцаў» (абедзве 1987), «Старонкі гісторыі Кампартыі Беларусі: меркаванні, аргументы, факты» (1990), «Кастрычнік 1917 і лёсы палітычнай апазіцыі» (ч. 1—3, 1993), «Палітычныя партыі Беларусі» (1994), «Праграмы палітычных партый Расіі, канец XIX — пачатак XX стст.», «Станаўленне і крушэнне аднапартыйнай сістэмы ў СССР, 1917—1991» (абедзве 1995), «Палітычныя партыі і палітычная паліцыя» (1996), «Гісторыя Беларусі» (ч. 2, 1998), «Беларусь на мяжы тысячагоддзяў» (2000), зб-каў арт. «Бальшавікі і непралетарскія партыі ў перыяд Кастрычніцкай рэвалюцыі і ў гады грамадзянскай вайны» (1982), «Перабудова і міжнацыянальныя адносіны» (1989). Удзельнічаў у падрыхтоўцы зб-каў дакументаў і матэрыялаў «К.Каліноўскі: З друкаванай і рукапіснай спадчыны», «Па волі народа: З гісторыі ўтварэння БССР і стварэння КПБ» (абодва 1988), «Ідэалагічная дзейнасць Кампартыі Беларусі, 1918—1945» (ч. 1, 1990) і інш.

Тв.: Непазбежнае банкруцтва. Мн., 1974; На защите идей Октября: Из истории идейно-полит. борьбы в Белоруссии в годы гражданской войны (1919—1920 гг.). Мн., 1978; Почему не состоялась БНР? Мн., 1980 (разам з І.І.Коўкелем); На пути к истине: (Из истории нац.-освободит. движения в Белоруссии, 1917 г.). Мн., 1983; Приговор революции: Крушение антисов. движения в Белоруссии, 1917—1925. Мн., 1985; На грани возможного: Идейно-полит. борьба вокруг создания бел. государственности // Неман. 1989. № 10—11; Гісторыя Беларусі: Насельніцтва, фарміраванне і вызначэнне этніч. і дзярж.-адм. межаў. Беларускае замежжа. 2 выд. Мн., 1997 (разам з Г.С.Марцулем); Юбилей, который всегда с нами // Бел. думка. 1998. № 12; Проблемы учебника: к вопросу о формировании однопарт. системы в Беларуси // Гісторыя: прабл. выкладання. 1999. № 1; Перадумовы і працэс стварэння палітычных партый на Беларусі (канец XIX ст. — люты 1917 г.) // Бел. гіст. часоп. 1999. № 3—4. *А.В.Скараход.*

СТА́ШЫЦ (Staszic) Станіслаў (ліст. 1755, г. Піла Велікапольскага ваяв., Польшча — 20.1.1826), польскі філосаф, публіцыст, грамадскі і дзярж. дзеяч, вучоны-натураліст. З 1799 ксёндз. Вучыўся ва ун-тах Лейпцыга, Гётынгена, Парыжа. У час працы *Чатырохгадовага сойма 1788—92* прапанаваў праграму рэформ антыфеад. характару. Адзін са стваральнікаў у 1800 у Варшаве Т-ва сяброў навук, у 1806—26 яго старшыня, ахвяраваў для т-ва сваю сядзібу («палац С.»). У 1807—12 чл. Адукац. палаты, у 1810—12 чл. Дзярж. Савета *Варшаўскага герцагства*. З 1815 чл. і кіраўнік шэрагу дзярж. устаноў *Каралеўства Польскага*; адзін з заснавальнікаў Варшаўскага ун-та (1816), горнай школы ў Кельцах і інш. У 1816 заснаваў у Грубешаве сялянскае т-ва, якому перадаў у вечнае карыстанне свае землі. Шмат зрабіў для развіцця навукі, асветы, горназдабыўной прам-сці. Аўтар антыпрыгонніцкай публіцыстыкі, кнігі «Пра геалогію Карпат...» (1815) і інш. Асн. філас. твор С. — паэма «Род чалавечы» (1819—20) — энцыклапедыя польскага *Асветніцтва*.

Літ.: Chyra-Rolicz Z. Stanisław Staszic. Warszawa, 1980; Wysokiński J. Szlakiem Stanisława Staszica. Warszawa,1988. *Ю.В.Бажэнаў.*

СТАШЭ́ЎСКІ Аляксандр Восіпавіч (Сташэўскі-Стасевіч; 24.3.1889, в. Думічы Капыльскага р-на Мінскай вобл. — 11.12.1938), дзяржаўны дзеяч БССР. Скончыў Мінскі Бел. пед. ін-т (1920). У 1911—14 выкладаў у Рэчыцкім прыходскім вучылішчы. З 1916 у рас. арміі. З 1918 удзельнік бел. нац. руху, чл. арг-цыі «*Маладая Беларусь*». Удзельнік антыпольскага падп. і партыз. руху на Міншчыне, у студз. 1920 адзін з ініцыятараў стварэння *Беларускай камуністычнай арганізацыі*, чл. яе ЦК. У жн. 1920 кааптаваны ў склад КП(б)Б. У 1921 абраны сакратаром ЦВК і СНК БССР. З 1924 старшыня Полацкага акр. выканкома, спрыяў правядзенню палітыкі *беларусізацыі*. З 1926 нарком унутр. спраў БССР, з 1928 нарком юстыцыі і пракурор БССР. Чл. ЦВК БССР у 1921—31 і яго Прэзідыума ў 1921—24 і 1927—31. Чл. Рэвіз. камісіі КП(б)Б у 1924—25, чл. ЦКК КП(б)Б у 1929—31. 28.1.1931 абвінавачаны ва ўдзеле ў «антыпартыйнай групе Ігнатоўскага—Жылуновіча», зняты з пасады і прызначаны старшынёй Бабруйскага райвыканкома, 18.2.1931 выведзены са складу ЦКК КП(б)Б. З восені 1931 заг. рабфака БДУ, са снеж. 1931 дырэктар Гомельскага с.-г. пед. ін-та. 27.4.1937 арыштаваны, 29.10.1937 прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Рэабілітаваны ў 1957. *У.В.Ляхоўскі.*

СТАШЭ́ЎСКІ Васіль Пятровіч (23.3.1895, в. Лугавая Капыльскага р-на Мінскай

вобл. — 29.10.1937), бел. пісьменнік. Скончыў Мінскі настаўніцкі ін-т (1924). Настаўнічаў. З 1926 працаваў адказным сакратаром літ. аб'яднанняў «Маладняк», «Полымя», у газ. «Савецкая Беларусь» (1928—29). У 1937 рэпрэсіраваны, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1957. Друкаваўся з 1923. Аўтар больш чым 20 п'ес: «Бацька і сын» (1927), «Музы́ка Цвілеўскі», «Спявай, вясна!» (абедзве 1928), «Архангелы з крэсаў» (1929), «Віхор» (1930), «На варце» (1932), «На платформу» (1934), «Самсон і Людміла» (1936), «Мікола Гоман» (паст. 1936) і інш. Выдаў кнігі нарысаў «Гаворыць Асінстан...», «Па сонечным шляху», «Чырвоны сцяг» (усе 1930), «Койданаўская МТС» (1931), «Каласіцца зямля» (1932). Лепшыя творы С. вылучаюцца добрым веданнем жыцця, арыгінальным спалучэннем лірызму, тонкага гумару з публіцыст. накіраванасцю. На бел. мову пераклаў аповесць І.Мікітэнкі «Вуркаганы», п'есу М.Ірчана «Сям'я шчотачнікаў», паасобныя творы А.Афінагенава, А.Карнейчука, І.Качаргі, І.Ле, І.Сенчанкі і інш. *І.П.Чыгрын.*

СТАЯ́НАЎ Людміл (сапр. З л а т а р а ў Георгі Стаянаў; 6.2.1886, с. Кавачэвіца, Балгарыя — 11.4.1973), балгарскі пісьменнік, перакладчык. Нар. дз. культ. Балгарыі (1963). Герой Сац. Працы Балгарыі (1963). Акад. Балг. АН (з 1946). Друкаваўся з 1905. Выступіў як паэт-сімваліст (зб-кі «Здані на раздарожжы», 1914; «Меч і слова», 1917). Пад уплывам рэв. руху звярнуўся да сац. праблематыкі (зб. «Святая святых», 1926). У паэт. зб-ках «Зямное жыццё» (1939), «За жалезнай заслонай» (1953), аповесцях «Срэбнае вяселле палкоўніка Матава» (1933), «Халера» (1935) і інш. ідэі грамадзянскасці, сцвярджэнне гуманіст. і рэаліст. прынцыпаў. Аўтар раманаў «На світанні» (1945), «Вайна» (1973), аўтабіягр. аповесці «Дзяцінства» (1962), зб-каў апавяданняў, драм. і публіцыст. твораў. Пераклаў асобныя вершы Я.Купалы, Я.Коласа, Цёткі. На бел. мову некат. творы С. пераклалі М.Гамолка, Н.Гілевіч, М.Хведаровіч. Дзімітроўская прэмія 1950.



Л.Стаянаў.

Тв.: Бел. пер. — у кн.: Ад стром балканскіх. Мн., 1965; У кн.: Скарб. Мн., 1967; У кн.: Сто гадоў, сто паэтаў, сто песень. Мн., 1978; Рус. пер. — Избр. проза. М., 1970; Избранное. М., 1983.

Літ.: З а х а р ж е в с к а я В.А. Людмил Стоянов. Киев, 1982; Л и х а ч е в а Л.П. Людмил Стоянов: Биобиблиогр. указ. М., 1964.

СТАЯ́НКА, неўмацаванае пасяленне чалавека каменнага і бронзавага вякоў, на якім пры даследаванні знаходзяць рэшткі жытлаў, агнішчаў, прылады працы і вырабы. Тэрмін «С.» ўзнік у 19 ст. для абазначэння месцаў часовага пасялення першабытных людзей, пазней — аселых плямён. Самыя стараж. С. на Беларусі адносяцца да позняга палеаліту — *Бердыж*, *Юравічы*. Рэшткі мезалітычных С. трапляюцца па ўсёй тэр. Беларусі (напр., Белая Сарока, Журавель). Неалітычныя С. размяшчаліся пераважна на рачных і азёрных тэрасах і поймавых дзюнах (напр., *Добры Бор*, *Камень*, Раманавічы, *Русакова*, *Скема*). На большасці неалітычных С. жыццё прадаўжалася і ў бронз. веку. *У.П.Ксяндзоў.*

«СТАЯ́ННЕ НА УГРЫ́» 1480, ваенныя дзеянні паміж ханам *Вялікай Арды Ахматам* і вял. князем маскоўскім *Іванам III* у 1480. У 1476 Іван III прыпыніў выплату Ардзе штогадовага грашовага «выхаду», які збіраўся з рус. зямель з часоў Батыя. Хан Ахмат, заняты барацьбой з *Крымскім ханствам*, толькі ў 1480 вырашыў пачаць актыўныя дзеянні супраць маскоўскага княства. Ён правёў перагаворы з вял. князем ВКЛ і каралём Польшчы *Казімірам IV* аб ваен. дапамозе. Іван III у сваю чаргу заключыў ваен. саюз з крымскім ханам *Менглі-Гірэем* (сапернікам Ахмат-хана) і дамовіўся пра выступленне яго супраць Казіміра IV. У студз. 1480 супраць Івана III паўсталі яго браты Барыс і Андрэй Большы, незадаволеныя ўзмацненнем улады вял. князя. Выкарыстаўшы гэтыя абставіны, восенню Ахмат распачаў свой паход. Імкнучыся абысці р. Ака, 8 кастр. Ахмат падышоў да прытока Акі р. Угра. Яго спроба фарсіраваць раку была адбіта сынам Івана III Іванам Маладым і братам вял. кн. Андрэем Меншым. Ахмат адышоў, верагодна, да Варатынска, дзе стаў чакаць падыходу Казіміра IV. Іван III, замацаваўшыся ў г. Крэменец, з мэтай выйграць час пачаў перагаворы з Ахматам. 30 вер. — 3 кастр. Іван III паразумеўся з мяцежнымі братамі, і іх палкі прыйшлі ў Крэменец. 26 кастр. Угра замерзла. Аднак Ахмат, даведаўшыся пра месцазнаходжанне войск братоў Івана III і не атрымаўшы дапамогі ад саюзніка (у гэты час Менглі-Гірэй напаў на паўд. землі ВКЛ), не адважыўся наступаць. 11 ліст. тат.-манг. войскі адышлі на поўдзень. 6 студз. 1481 Ахмат быў забіты пры сутычцы з войскамі цюменскага хана Ібака, і ў Вял. Ардзе пачаліся міжусобіцы. Гэтыя падзеі паклалі канец мангола-тат. панаванню і Рус. дзяржава стала суверэннай.

Літ.: Н а с о н о в А.Н. История русского летописания XI — начала XVIII в. М., 1969. С. 418—435; Б а з и л е в и ч К.В. Внешняя политика Русского Централизованного государства. Вторая половина XV в. М., 1952.

СТАЯ́ЧАЕ ВО́ЗЕРА. У Чачэрскім р-не Гомельскай вобл., у бас. р. Сож, за 5 км на Пд ад г. Чачэрск. Пл. 0,42 км^2, даўж. 1 км, найб. шыр. 500 м, даўж. берагавой лініі 2,5 км. Пл. вадазбору 5,25 км^2. Схілы катлавіны выш. да 5 м (на З да 10 м, на У 16—18 м), разараныя. Берагі выш. да 0,5 м. Дно выслана сапрапелем, каля берагоў пясчанае.

СТАЯ́ЧАЯ ХВА́ЛЯ, хваля, якая ўзнікае ў выніку *інтэрферэнцыі хваль*, што распаўсюджваюцца ў процілеглых напрамках і маюць аднолькавую амплітуду і частату. У С.х., у адрозненне ад *бягучай хвалі*, энергія не пераносіцца, а адбываецца перапампоўванне аднаго віду энергіі ў другі, напр., кінетычнай у патэнцыяльную, эл. у магн. (адсюль назва).

С.х. ўзнікаюць пры адбіцці хваль ад перашкод ці неаднароднасцей у газападобным, вадкім ці цвёрдым асяроддзі, а таксама ў вакууме (для эл.-магн. хваль) пры накладанні адбітай і прамой хваль. Розныя ўчасткі С.х. маюць аднолькавую фазу і розныя амплітуды, залежныя ад рознасці фаз прамой і адваротнай хвалі. Пункты С.х. з максімальнай амплітудай ваганняў наз. пучнасцямі, з амплітудай, роўнай нулю, — вузламі. Адлегласць паміж суседнімі вузламі (пучнасцямі) роўныя $\lambda/2$, а паміж суседнімі вузлом і пучнасцю — $\lambda/4$, дзе λ — даўжыня бягучай хвалі. С.х. ўзнікаюць у ЗВЧ антэнах, хваляводах, рэзанатарах.

СТВАЛО́ВЫЯ КЛЕ́ТКІ, к а м б і я л ь н ы я к л е т к і, родапачынальныя ўзнаўляльныя клеткі ў тканках жывёл (крывятворнай і лімфоіднай, у эпідэрмісе, покрыве стрававальнага тракту і інш.). Размнажэннем і дыферэнцыроўкай С.к. аднаўляюць страту спецыялізаваных клетак пасля іх натуральнай, узроставай ці фізіял. гібелі, а таксама ў аварыйных сітуацыях. Яны індывідуальныя для кожнага тканкавага тыпу, але ў яго межах здольны развівацца ў розных кірунках (напр., у крывятворнай тканцы млекакормячых С.к. дыферэнцыруюцца ў эрытрацыты, лейкацыты або мегакарыяцыты). З'яўляюцца самападтрымліваючымі; пасля дзялення С.к. адна клетка застаецца ў стваловай лініі, другая ператвараецца ў спецыялізаваную. Узнаўляльныя клеткі раслін утвараюцца з *мерыстэмы* і з'яўляюцца родапачынальнікамі тканак расл. арганізма (покрыўнай, праводнай і інш.). *А.С.Леанцюк.*

СТВОЛ у б а т а н і ц ы, галоўнае (восевае) адраўнелае сцябло дрэва. Пачынаецца ад шыйкі кораня і заканчваецца верхавінкай. Звычайна прамы, бывае скрыўлены, часам палягае; у дрэвавых ліян можа быць павойным. Служыць апорай для кроны, выносіць лісце да святла. Зімой С. — акумулятар вільгаці і пажыўных рэчываў, вясной і летам у ім адбываецца рух сокаў. Асн. маса С. — драўніна (другасная *ксілема*), дыферэнцыраваная на гадавыя слаі (кольцы), і *кара*. У лясной прам-сці С. — аб'екты нарыхтовак.

СТВОЛ, 1) у п а ж а р н а й т э х н і ц ы — б р а н д с п о й т (устарэлае), прыстасаванне (труба з насадкамі на

канцы) для стварэння і накіравання струменяў сумесі вады, пены, парашку і інш. для тушэння агню. Падзяляюцца на лафетныя (бываюць стацыянарныя, што замацоўваюцца на аўтамабілі, катэры, вышцы і інш., пераносныя і перавозныя) і ручныя, якімі камплектуюцца пажарныя аўтамабілі, мотапомпы, унутр. пажарныя краны. 2) У ваеннай справе — асн. ч. *агнястрэльнай зброі* для выкідвання снарада (гранаты, міны, кулі) і надання яму ўстойлівага палёту ў патрэбным напрамку. Унутраная поласць (канал) С. складаецца з каморы, дзе размяшчаецца зарад, і вядучай часткі. У час выстралу з казённай (задняй) часці С. закрываецца затворам. Бываюць С. незмацаваныя, разборныя і змацаваныя; наразныя (гл. *Наразная зброя*) і гладкаствольныя. Даўжыня С. залежыць ад прызначэння зброі. 3) У горнай справе, гл. *Шахтавы ствол.*

«СТО ДЗЁН», час другога праўлення *Напалеона I* у Францыі (20.3—22.6.1815). 1.3.1815 Напалеон на чале атрада каля 1 тыс. чал. уцёк з в-ва Эльба (аддадзенага яму ў пажыццёвае валоданне ў крас. 1814) і высадзіўся на Пд Францыі. Насельніцтва, незадаволенае палітыкай *Бурбонаў*, якія вярнуліся з эміграцыі, аказала Напалеону падтрымку; каралеўскія войскі на чале з маршалам М.Неем, адпраўленыя супраць б. імператара, перайшлі на яго бок. 13 сак. Напалеон выдаў у Ліёне дэкрэт аб аднаўленні імперыі. 20 сак., не сустрэўшы супраціўлення, ён увайшоў у Парыж. Кароль Людовік XVIII уцёк у Бельгію. 21 чэрв. абвешчана новая канстытуцыя, складзеная ў памяркоўна ліберальным духу. Манархі інш. еўрап. краін адмовіліся прызнаць аднаўленне імперыі Напалеона I. Расія, Вялікабрытанія, Аўстрыя і Прусія стварылі 7-ю антыфранц. кааліцыю і выставілі супраць Францыі войска ў 900 тыс. чал. на чале з А.У.*Уэлінгтанам*. 18 чэрв. ў бітве пры *Ватэрлоо* армія Напалеона была разбіта. 22 чэрв. ён другі раз адрокся ад прастола.

П.А.Тупік.

«СТО ДЗЁН РЭФО́РМ», спроба правесці дзярж. рэформы ў Кітаі ў 1898. Пачаліся 11 чэрв., калі імператар Цзай Цянь (больш вядомы як Гуансюй) з маньчжурскай дынастыі *Цын* выдаў указ «Пра ўсталяванне асн. лініі дзярж. палітыкі». За кароткі час Гуансюй выдаў больш за 60 указаў, падрыхтаваных групай маладых рэфарматараў на чале з *Кан Ювэем* і *Лян Цічао*, якія тычыліся сістэмы адукацыі, буд-ва чыгунак, заводаў, мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі, развіцця ўнутр. і знешняга гандлю, рэарганізацыі ўзбр. сіл. Ажыццяўленню рэформ супрацьдзейнічала ўплывовая група саноўнікаў, блізкіх да б. рэгентшы імператрыцы-ўдавы *Цысі*. Рэфарматары падрыхтавалі змову з мэтай ліквідацыі сваіх праціўнікаў, аднак 21 вер. палацавая варта ізалявала Гуансюя ў яго палацы. Было абвешчана пра аднаўленне рэгенцтва Цысі нібыта з-за псіхічнай хваробы імператара. Большая ч. рэфарматараў пакарана смерцю; Кан Ювэй, Лян Цічао і Ван Чжао ўцяклі за мяжу.

Літ.: Тихвинский С.Л. Движение за реформы в Китае в конце XIX в. и Кан Ювэй. М., 1959.

СТОГАДО́ВАЯ ВАЙНА́ 1337—1453, серыя войнаў паміж Англіяй і Францыяй. Традыцыйна падаецца як барацьба за карону Францыі паміж франц. *Валуа* і англ. *Плантагенетамі*, пазней *Ланкастэрамі*. Глыбіннай асновай канфлікту былі барацьба Англіі і Францыі вакол Гіені і Фландрыі, жаданне Англіі вярнуць Нармандыю, Мэн, Анжу і інш. страчаныя ўладанні Плантагенетаў. Першы этап вайны (1337—1360) быў паспяховы для англічан: у 1340 яны разбілі франц. флот каля Слёйса (Эклюза), у 1346 — франц. войскі каля Крэсі, у 1347 — узялі Кале; у 1356 сын караля Эдуарда III прынц Уэльскі Эдуард («Чорны прынц») перамог французаў у бітве каля Пуацье і ўзяў у палон франц. караля Іаана II Добрага. Ваен. дзеянні, шматлікія разбурэнні, павелічэнне падаткаў прывялі да *Парыжскага паўстання 1357—58* і *Жакерыі*. Франц. ўрад быў вымушаны заключыць цяжкі мір у Брэціні. На другім этапе С.в. (1369—96) новы кароль Францыі Карл V [1364—80] рэарганізаваў войска, узмацніў артылерыю і да канца свайго праўлення выцесніў англічан амаль з усёй тэр. Францыі. На трэцім этапе С.в. (1415—53), у час праўлення псіхічна хворага Карла VI [1380—1422], Францыя была аслаблена грамадз. вайной Бургундскага і Арлеанскага дамоў 1405—35 (т.зв. вайна бургіньёнаў і арманьякаў). Сітуацыю выкарыстаў англ. кароль Генрых V [1413—22], які высадзіўся ў Францыі і ў бітве пры Азенкуры 25.10.1415 разграміў франц. войска. У выніку шматлікіх перагавораў і міждынастычных шлюбаў у 1422 англічане і бургундцы прызналі каралём Англіі і Францыі немаўля Генрыха VI [1422—61 і 1470—71], рэгентам пры якім стаў англ. герцаг Бэдфард. Адначасова каралём Францыі абвясціў сябе і дафін Шарль, пад уладай якога заставаліся Цэнтр. і Паўд. Францыя. У 1428 англічане аблажылі г. Арлеан, з узяццем якога адкрываўся шлях англ. арміі на Пд Францыі. У гэты ж час пры франц. двары з'явілася *Жанна д'Арк*, якая ўзначаліла вызв. вайну франц. народа. У маі 1429 знята аблога з Арлеана, у ліп. Карл VII каранаваны франц. каронай. У выніку Араскага міру (21.9.1435) на бок франц. караля перайшоў герцаг Бургундскі. У 1436 вызвалены Парыж, да 1441 англічане страцілі Шампань, да 1450 — Нармандыю і Мэн, да 1453 — Гіень. На тэр. Францыі яны захавалі толькі Кале (да 1558). Мір паміж Людовікам XI і Эдуардам IV у Пікіні 29.8.1475 паклаў канец дамаганням англічан на франц. карону. Аднак толькі пасля *Ам'енскага мірнага дагавора 1802* англ. каралі перасталі тытулаваць сябе і «каралямі Францыі».

Літ.: Басовская Н.И. Столетняя война 1337—1453 гг. М., 1985; Яе ж. Столетняя война: Леопард против лилии. М., 2002; Перну Р., Клэн М.-В. Жанна д'Арк: Пер. с фр. М., 1992; Сьюард Д. Генрих V: Пер. с англ. Смоленск, 1996. *Дз.М.Чаркасаў.*

СТО́ЙБІШЧА, тырла, агароджанае месца на *пашы*, абсталяванае для даення кароў, адпачынку, начлегу жывёл і ўкрыцця іх у непагадзь. Будуецца звычайна пры стойлава-лагерным утрыманні жывёл (штогод мяняецца месца). Размяшчаецца ў зацішным, сухім месцы, паблізу вадаёма, за 200—300 м ад дарогі. Абсталёўваецца кармушкамі, вадапойнымі карытамі, пры неабходнасці — павецямі.

СТОК-ОН-ТРЭНТ (Stoke-on-Trent), горад у цэнтр. Вялікабрытаніі, на ПнЗ ад Бірмінгема, на р. Трэнт і канале Трэнт—Мерсі. Каля 300 тыс. ж. з прыгарадамі (2000). Вузел чыгунак і аўтадарог, рачны порт. Цэнтр старадаўняга раёна ганчарства (т.зв. ганчарная акруга), які дае каля 80% вытв-сці фарфорафаянсавых і керамічных вырабаў краіны. Прам-сць: металургічная, лакафарбавая, шынная. Ун-т. Паблізу каменнавугальныя шахты.

СТО́КПАРТ (Stockport), горад на З Вялікабрытаніі, на ПдУ канурбацыі Вял. *Манчэстэр*, на р. Мерсі. Каля 300 тыс. ж. (2000). Трансп. вузел. Прам-сць: маш.-буд. (станкі, рухавікі, абсталяванне для тэкст. прам-сці), тэкст., швейная, хім., харчовая. Вядомы і як цэнтр вытв-сці капелюшоў.

СТОКС (Stokes) Джордж Габрыэль (13.8.1819, Скрын, Вялікабрытанія — 1.2.1903), англійскі фізік і матэматык,



Дж.Г.**Стокс**.

адзін са стваральнікаў *гідрадынамікі*. Чл. Лонданскага каралеўскага т-ва (1851) і яго прэзідэнт (1885—90). Скончыў Кембрыджскі ун-т (1841), дзе і працаваў (з 1849 праф.). Навук. працы па гідрадынаміцы, оптыцы, гравіметрыі і вектарным аналізе. Распрацаваў тэорыю руху вязкай вадкасці (ураўненне Наўе — С.), вызначыў сілу супраціўлення руху шара ў вадкасці (гл. *Стокса закон*). Устанавіў сувязь паміж даўжынёй хвалі фоталюмінесцэнцыі і даўжынёй хвалі ўзбуджальнага святла (правіла С.), сфармуляваў адну з асн. тэарэм вектарнага аналізу (гл. *Стокса формула*). Яго імем

названа адзінка кінематычнай вязкасці ў СГС сістэме адзінак — стокс.

СТО́КСА ЗАКО́Н у гідрадынаміцы, закон, які вызначае сілу супраціўлення, што дзейнічае на цвёрды шар пры яго павольным паступальным руху ў неабмежаванай вязкай вадкасці. Паводле С.з. сіла супраціўлення $F = 6\pi\mu rv$, дзе μ — каэфіцыент дынамічнай *вязкасці*, r — радыус шара, v — яго скорасць. Устаноўлены Дж.Г.*Стоксам* (1852). Выконваецца пры малых *Рэйнальдса ліках* і выкарыстоўваецца ў калоіднай хіміі, малекулярнай фізіцы і метэаралогіі.

СТО́КСА ФО́РМУЛА, адна з асн. інтэгральных тэарэм *вектарнага аналізу*, якая звязвае паверхневы інтэграл з крывалінейным. У вектарнай форме мае выгляд: $\oint_L \vec{a} \cdot d\vec{r} = \int_S rot\vec{a} \cdot d\vec{S}$, дзе $\vec{a} = \vec{a}(M)$ — вектарнае поле, зададзенае ў кожным пункце M на паверхні S; $rot\vec{a}$ — *ротар* вектарнага поля $\vec{a}$; L — замкнёная крывая, якая абмяжоўвае паверхню S. Прапанавана Дж.Г.*Стоксам* (1854). Гл. таксама *Астраградскага формула*.

СТО́ЛІН, горад, цэнтр Столінскага р-на Брэсцкай вобл., на р. Гарынь. На аўтадарозе Пінск—Давыд-Гарадок, за 7 км ад чыг. ст. Гарынь на лініі Лунінец—Сарны (Украіна), за 245 км на У ад Брэста. 12,5 тыс. ж. (2001).

Вядомы з 16 ст. як мястэчка ў Пінскім пав. Берасцейскага ваяв. Прыватнае ўладанне з драўляным замкам, належала Саламярэцкім, Вішнявецкім, Пацеям, Солтанам, Скірмунтам, Стахоўскім і інш. У час вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—67 у вер. 1655 С. узялі і спалілі казакі І.*Залатарэнкі*. Пры вызваленні войскамі ВКЛ Пагарыння на подступах да С. адбылася няўдалая для іх бітва. Пасля гэтых падзей замак прыйшоў у заняпад. У 1792—93 цэнтр Запінскага пав. Берасцейскага ваяв. Пасля 2-га падзелу Рэчы Паспалітай (1793) у складзе Рас. імперыі, мястэчка, цэнтр воласці Пінскага пав. Мінскай губ. У 1897 у С. 3,3 тыс. ж., 250 двароў, пач. вучылішча, бровар, смалакурня. З 1921 у складзе Польшчы, горад, цэнтр гміны ў Лунінецкім пав. Палескага ваяв., 4763 ж.; з 1922 цэнтр *Столінскага павета*. З 1939 у БССР, з 15.1.1940 цэнтр *Столінскага раёна* Пінскай, з 1954 Брэсцкай абл. У Вял. Айч. вайну з 12.7.1941 да 7.7.1944 акупіраваны нямецка-фашыстамі, якія загубілі ў С. і раёне 9309 чал. У студз. 1944 партызаны брыгады «Савецкая Беларусь» і атрадаў злучэння С.А.Каўпака разгромілі ў С. ням.-фаш. гарнізон. У 1970 — 7,1 тыс. жыхароў.



Комплекс будынкаў аграрна-эканамічнага каледжа ў г. **Столін**.

Працуюць: масласырзавод, хлебазавод, ф-ка кухоннай мэблі, 2 перасоўныя механіз. калоны, дарожная рамонтна-буд. калона, дарожна-буд. ўпраўленне, «Сельгасхімія», прадпрыемства меліярацыйных сетак і інш.; *Столінскі аграрна-эканамічны каледж*, ПТВ-164, гімназія, 2 сярэднія, дзіцяча-юнацкая спартыўная школы, школа мастацтваў, Дом дзіцячай творчасці, Дом культуры, Дом рамёстваў, 2 б-кі, раённае тэр. мед. аб'яднанне, *Столінскі краязнаўчы музей*. Правасл. царква, царква хрысціян веры евангельскай. Брацкая магіла сав. воінаў, партызан і ахвяр фашызму, магіла ахвяр фашызму. Мемарыял памяці воінаў-вызваліцеляў і землякоў, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Помнікі: Вызвалення, землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Помнікі архітэктуры: Свята-Узнясенская царква (1-я пал. 20 ст.), будынак сінагогі (1792). На паўд.-ўсх. ускраіне *Столінская сядзіба «Манькавічы»*.

СТО́ЛІНСКАЯ СЯДЗІ́БА «МА́НЬКАВІЧЫ». Існавала ў 18 — 1-й пал. 20 ст. ў б. сядзібе Радзівілаў у в. Манькавічы (цяпер у Столінскім р-не Брэсцкай вобл.). У пач. 18 ст. сядзібны комплекс уключаў жылыя дамы — 2 панскія (стары і новы), некалькі для прыслугі каля ўязной брамы, гасп. пабудовы і сад. У 2-й пал. 18 ст. пастаўлены дом аканома, гасп. пабудовы. У 1780-я г. ўзведзены драўляны палац, перабудаваны ў канцы 19 ст. паводле праекта арх. Вентцэля ў стылі несапраўднай готыкі. Прамавугольны ў плане будынак пад гонтавым дахам. У пач. 19 ст. каля палаца пабудавалі драўляны флігель пад гонтавым дахам, дом для прыслугі, кухню, конна-валовы млын, 3 гумны з прыбудаванымі ў тарцах свірнамі, саладоўню і інш. Пры ўездзе ў сядзібу пастаўлена манум. брама — 1-павярховы з мансардамі і цокалем прамавугольны ў плане будынак, накрыты складаным дахам. Дамінантай кампазіцыі была гранёная вежа, завершаная купалам з барабанам і шатром над ім. У 1885 вакол палаца, які стаяў на насыпной тэрасе, закладзены парк пейзажнага тыпу пл. 50 га (цяпер 27,9 га). Фарміраваўся ён пры садзейнічанні Марыі Радзівіл, пра што сведчыць надпіс на закладным камені (устаноўлены на ўзлеску цэнтр. паляны). Тэраса абмежавана земляным валам выш. да 1,5 м з кветнікамі і дэкар. кустамі. Астатняя ч. на раўнінным рэльефе. Пры ўездзе ў парк з боку Століна пабудаваны павільён і каваныя вароты. У Вял. Айч. вайну палац згарэў, дрэвы парку моцна пашкоджаны, вывезены вароты. Расце больш за 35 відаў дрэў і кустоў, ёсць вадаём з фантанам і лебедзямі. *Н.С.Будыка, Ю.А.Якімовіч.*



Столінская сядзіба «Манькавічы». Фота пач. 20 ст.

СТО́ЛІНСКІ АГРА́РНА-ЭКАНАМІ́ЧНЫ КАЛЕ́ДЖ. Засн. ў 1940 у г. Столін Брэсцкай вобл. як с.-г. тэхнікум, з 1997 аграрна-эканам. каледж. Рыхтуе бухгалтараў, эканамістаў і юрыстаў. Спецыяльнасці (2001/02 навуч. г.): бухгалтарскі ўлік і кантроль; эканоміка і кіраванне; правазнаўства. Прымае асоб з базавай і сярэдняй адукацыяй. Навучанне дзённае і завочнае.

СТО́ЛІНСКІ КРАЯЗНА́ЎЧЫ МУЗЕ́Й. Створаны ў 1954 па ініцыятыве і на базе збораў краязнаўца Б.В.Міралюбава, адкрыты ў 1955 у г. Столін Брэсцкай вобл. Пл. экспазіцыі 206 м^2, больш за 11,7 тыс. экспанатаў асн. фонду (2002). Мае 4 аддзелы: археалогіі, гісторыі, этнаграфіі, прыроды. Сярод экспанатаў ляпная і ганчарная кераміка, каменная сякера, жал. наканечнікі коп'яў і стрэл, бронзавыя жаночыя ўпрыгожанні, зброя 12—13 ст. з археал. помнікаў *Велямічы*, *Дубай*, *Рубель*, *Хотамель* і інш., прадметы сял. побыту 19—20 ст., матэрыялы пра дзейнасць падполля і партыз. рух у Вял. Айч. вайну, пасляваеннае развіццё раёна. Аддзел прыроды знаёміць з жыццём буйнейшай у Еўропе калоніі шэрай чаплі, гісторыяй спецыялізаванага балотнага запаведніка, экспанатамі раслінная і жывёльнага свету рэгіёна. У этнагр. аддзеле калекцыі традыц. ганчарнага промыслу, нар. ткацтва, адзення, вышыванак, карціны мясц. мастакоў, вырабы разьбяроў па дрэве, саломапляцення, вязання і макрамэ, калекцыя муз. інструментаў. *З.К.Юхневіч.*

СТО́ЛІНСКІ ПАВЕ́Т, адм.-тэр. адзінка ў 1922—39 у Польшчы, у складзе Палескага ваяв. Цэнтр — г. *Столін*. Утвораны 6.12.1922 з Бярозаўскай, Плотніцкай, Столінскай, Хорскай, Церабяжоўскай гмін Лунінецкага, Высоцкай гміны Сарненскага і Радчыцкай гміны Пінскага паветаў. Са снеж. 1939 у Пінскай вобл. БССР. 15.1.1940 скасаваны, на тэр. павета ўтвораны раёны.

СТО́ЛІНСКІ РАЁН. Размешчаны на ПдУ Брэсцкай вобл. Утвораны 15.1.1940 (у сучасных межах з 19.1.1961). Пл. 3,4 тыс. км^2. Нас. 87,6 тыс. чал. (2002), гарадскога 30%. Сярэдняя шчыльн. 26 чал. на 1 км^2. Цэнтр — г. *Столін*. Уключае г. *Давыд-Гарадок*, р.п. *Рэчыца*, 95 сельскіх нас. пунктаў, Давыд-Гарадоцкі гар. Савет, Рэчыцкі пасялковы Савет, 18 сельсаветаў: Альшанскі, Белавушскі, Беражноўскі, Веляміцкі, Відзіборскі,

Вялікамалешаўскі, Гараднянскі, Глінкаўскі, Лядзецкі, Манькавіцкі, Плотніцкі, Радчыцкі, Рамельскі, Рубельскі, Рухчанскі, Стружскі, Фядорскі, Харомскі. Тэр. раёна пацярпела ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, большая ч. яе забруджана радыенуклідамі да 5 Кі, на асобных участках да 15 Кі.

Раён знаходзіцца ў межах *Прыпяцкага Палесся*. Паверхня плоская, забалочаная, з участкамі градава-ўзгорыстага, дзюннага рэльефу і астанцамі надпоймавых тэрас. Пераважаюць выш. 130—140 м (80%), найвыш. пункт 168 м (каля в. Гарадная). Агульны нахіл паверхні з ПдЗ на ПнУ. Карысныя выкапні: торф, буд. і кварцавыя пяскі, тугаплаўкія і легкаплаўкія гліны (радовішчы *Глінка*, *Столінскія Хутары*), суглінкі, гаручыя сланцы (ч. *Тураўскага радовішча гаручых сланцаў*), буры вугаль. Сярэдняя т-ра студз. -5,4 °С, ліп. 18,6 °С. Ападкаў 547 мм за год. Вегетац. перыяд 203 сут. Найб. р. Прыпяць і яе прытокі Стыр, Гарынь, Сцвіга з Маствой (Львой). Воз. Вял. Засамінае; вадасх. Дубянецкае і Марочна. Пераважаюць глебы с.-г. угоддзяў: поймавыя забалочаныя (36,2%), дзярновыя і дзярнова-карбанатныя забалочаныя (20,6%), тарфяна-балотныя (20%), дзярнова-падзолістыя забалочаныя (11,7%), дзярнова-падзолістыя (11,3%). Пад лесам 38,4% тэрыторыі. Лясы хваёвыя, чорнаальховыя, дубовыя, бярозавыя, ясянёвыя, грабавыя і інш.; каля 19% з іх штучнага насаджэння. Найб. адметныя масівы Беражноўская і Сцесінская лясныя дачы. Пад балотамі 21,7% плошчы. У межах раёна заказнікі рэсп. значэння: ландшафтныя Альманскія балоты і *Сярэдняя Прыпяць*; мясц. значэння: ландшафтны Рухчанскі, біял. Церабяжова-Каладнянскі, гідралагічны Ястрабель (частка), бат. мікразаказнік Столінскі. Помнікі прыроды рэсп. значэння: парк Манькавічы (гл. *Столінская сядзіба «Манькавічы»*) і піхты каўказскія на паўн.-ўсх. ускраіне г. Столін; мясц. значэння: парк Новаберажное каля в. Беражное, парк і дуб чарэшчаты ў в. Ніжні Церабяжоў.

Агульная пл. с.-г. угоддзяў 114 тыс. га, з іх асушаных 51,6 тыс. га. На 1.1.2002 у раёне 28 калгасаў, с.-г. прадпрыемства «Манькавічы», 14 фермерскіх гаспадарак. Сельская гаспадарка спецыялізуецца на мяса-малочнай жывёлагадоўлі, свінагадоўлі, птушкагадоўлі, вырошчванні збожжавых і кармавых культур, бульбы, лёну, цукровых буракоў, зялёнага гарошку, садаводстве. Прадпрыемствы буд. матэрыялаў (цэгла), металаапр. (плугі для трактароў, ванны гальванічныя і інш.), дрэваапрацоўчай (кухонная мэбля, сталярныя вырабы), харч. (масла жывёльнае, сыры, кансервы плодаагароднінныя, сокі, хлебабулачныя вырабы і інш.), кааператыўнай (каўбасныя вырабы), паліўнай (торфабрыкет) прам-сці; эл.-мех. з-д (электрараспальванне для з-даў газавай апаратуры, эл. пледы награвальныя, грэлкі, настольныя лямпы, шашлычніцы), лясгас. Па тэр. раёна праходзяць чыгунка Лунінец—Сарны, аўтадарогі Пінск—Жыткавічы, Дубровіца (Украіна)—Жыткавічы. У раёне 1 гімназія, 34 сярэднія, 14 базавых, 8 пачатковых школ, 4 спарт., 4 муз. школы, 1 школа мастацтваў, 2 дамы дзіцячай творчасці, 3 вучэбна-вытворчыя камбінаты, ПТВ, *Столінскі аграрна-эканамічны каледж*, 24 дашкольныя ўстановы, 62 дамы культуры і клубы, 8 бальніц, скурна-венералагічны дыспансер, раённы цэнтр гігіены і эпідэміялогіі, 10 амбулаторый, 41 фельч.-ак. пункт. Музеі: *Столінскі краязнаўчы музей*, нар. этнагр. (в. Цераблічы), нар. славы (р.п. Рэчыца). Помнікі архітэктуры: цэрквы Васкрасенская (1817) у в. Альгомель, Успенская (1888) у в. Альпень, Троіцкая (1905) у в. Белавуша, Параскевы Пятніцы (пабудавана каля 1884 на падмурку царквы 18 ст., перабудавана ў 20 ст.) у в. Беражное, Ільінская (1881) у в. Велямічы, Троіцкая (пабудавана ў 18 ст., перабудавана ў 1930-я г.) у в. Гарадная, Раства Багародзіцы (1718—20) у в. Дубенец, Пакроўская (1875) у в. Плотніца, царква (сярэдзіна 19 ст.) у в. Радчыцк, Міхайлаўская (18 ст.) у в. Рамель, Міхайлаўская (1796) у в. Рубель, Раства Багародзіцы (1730) у в. Рухча 1-я, Пакроўская (канец 19 ст.) у в. Стахава. Гіст. помнік — цэнтр ганчарнага рамяства ў в. Гарадная (гл. *Гараднянская кераміка*). Выдаецца газ. «Навіны Палесся».

А.І.Вярэніч, Р.Р.Паўлавец.

СТО́ЛІНСКІ СТАДЫЯ́Л, адзін з буйных этапаў адступання *дняпроўскага зледзянення*. Краявыя марэны прадстаўлены асобнымі градамі ў раёне гарадоў Столін і Ельск. С.с. і наступны *мазырскі стадыял* раздзяліліся *ўздзенскім інтэрстадыялам*. Марэна С.с. (магутнасць 10—15 м) вызначаецца насычанасцю матэрыялам мясц. парод (мелу, палеагену, неагену), часта ўтрымлівае іх адорвені. Тыповыя флювіягляцыяльныя пароды — пяскі шэрыя, дробназярністыя, з уключэннем жвіру і галькі з мясц. парод (крэмень, кварцытападобны пясчанік і інш.), запаўняюць даліны сцёку талых ледавіковых вод або ўкрываюць водападзелы.



СТО́ЛЬБЕРГ (Ståhlberg) Карла Юха (28.1.1865, Суамусалмі, Фінляндыя — 22.9.1952), фінляндскі паліт. і дзярж. дзеяч, юрыст. У 1908—18 праф. адм. права ун-та ў Хельсінкі. Адзін з лідэраў ліберальнага крыла *младафінаў*, якое ў снеж. 1918 утварыла Нац. прагрэс. партыю. У 1898—1903 сакратар, у 1905—07 чл. сената, у 1914 старшыня парламента. З 1918 прэзідэнт вышэйшага адм. суда, кіраваў распрацоўкай фінл. канстытуцыі 1919. У 1919—25 прэзідэнт Фінляндыі. Спрыяў заключэнню ў кастр. 1920 мірнага дагавора з РСФСР (гл. *Савецка-фінляндскія дагаворы і па-*

гадненні). У 1931 і 1937 кандыдат у прэзідэнты Фінляндыі. У 1926—46 чл. камісіі па падрыхтоўцы законаў.

СТО́ЛЬНІК, шляхецкі ўрад (пасада) у ВКЛ з сярэдзіны 15 ст. Загадваў сервіроўкай велікакняжацкага стала і падачай страў. Кіраваў *падстоліямі*. Пазней выконваў функцыі намінальна. З сярэдзіны 17 ст. ўрад С. існаваў у паветах.

У.М.Вяроўкін-Шэлюта.

СТО́ЛЯР Абрам Аронавіч (20.2.1919, г.п. Таруціна Адэскай вобл., Украіна — 6.5.1993), бел. матэматык і педагог; адзін з заснавальнікаў бел. школы па дыдактыцы матэматыкі. Д-р пед. н., праф. (1972). Засл. работнік вышэйшай школы Беларусі (1977). Скончыў пед. ін-т (г. Бухара, 1947). З 1951 у Магілёўскім пед. ін-це (у 1973—86 прарэктар, адначасова ў 1953—89 заг. кафедры). Навук. працы па праблемах выкладання матэматыкі. Распрацаваў тэорыю дзейнага падыходу да навучання матэматыцы (ад дашкольнага перыяду да вышэйшай школы), прапанаваў канцэпцыю развіццёвага навучання, на падставе якой разам з інш. распрацаваў навучальна-метадычны комплекс па матэматыцы для пачатковай і 4—5-га кл. сярэдняй школы. Аўтар навуч. дапаможнікаў для школ і ВНУ.

Тв.: Логические проблемы преподавания математики. Мн., 1965; Методы обучения математике. Мн., 1966; Современные основы школьного курса математики. М., 1980 (у сааўт.); Педагогика математики. 3 изд. Мн., 1986.

СТО́МА Вячаслаў Іосіфавіч (н. 5.11.1949, в. Несутычы Навагрудскага р-на Гродзенскай вобл.), бел. пісьменнік. Скончыў БДУ (1972). Настаўнічаў, працаваў у органах рыбнай гаспадаркі. Друкуецца з 1974. Аўтар зб-каў прозы, публіцыстыкі, навук.-папулярных твораў і твораў для дзяцей «Тайны жывёльнага свету» (1989, з Э.Р.Самусенкам), «На воўчых сцежках», «У глыбінках адвечнага бору» (абодва 1991), «Гаспадар таямнічых віроў» (1992).

Тв.: Щедрость голубого гектара. Мн., 1990; У нерушы дзікай прыроды. Мн., 2001.

СТО́МА Здзіслаў Францавіч (17.8.1907, Мінск — 21.7.1992), бел. акцёр. Нар. арт. Беларусі (1961). Нар. арт. СССР (1968). Скончыў драм. студыю Польскага вандроўнага т-ра Беларусі (1929), працаваў у гэтым т-ры (1929, 1931—33), у т-рах Украіны (1935—36). З 1937 у Бел. т-ры юнага гледача, з 1940 у Бел. т-ры імя Я.Купалы. Вострахарактарны і камед. акцёр. Валодаў дасканалай пластыкай, багатай палітрай інтанацый, мімікі, жэста, здольнасцю да імправізацыі. Творчасць С. вызначалася жыццёвай верагоднасцю ў спалучэнні з яркім знешнім малюнкам ролі, выкарыстаннем гратэску. Стварыў самабытныя вобразы ў бел. рэпертуары: Быкоўскі, Пустарэвіч («Паўлінка» Я.Купалы), Куторга («Пінская шляхта» В.Дуніна-Марцінкевіча), Глушак («Людзі на балоце» паводле І.Мележа; Дзярж. прэмія Беларусі 1966), Лявон, Сенька-заіка («Лявоніха на арбіце», «Каб людзі не журыліся» А.Макаёнка), Туляга, Караўкін («Хто смяецца апошнім», «Брама неўміручасці» К.Крапівы), Бураўчык («Канстанцін Заслонаў» А.Маўзона), дзед Савось, Іаахім («Адкуль грэх?», «Напісанае застаецца» А.Петрашкевіча), Піліп Назараў («І змоўклі птушкі» І.Шамякіна). Сац. аналіз і псіхал. неадназначнасць уласцівы ролям класічнага рэпертуару: Хлопаў («Рэвізор» М.Гогаля), Белагубаў («Даходнае месца» А.Астроўскага), Епіходаў («Вішнёвы сад» А.Чэхава), Афанасій Мацвеевіч («Дзядзечкаў сон» паводле Ф.Дастаеўскага), Бенволіо, Пароль («Рамэо і Джульета», «Канец — справе вянец» У.Шэкспіра), Глап'е («Тысяча франкаў узнагароды» В.Гюго), Арлекін («Ілгун» К.Гальдоні). З інш. роляў: Крысіп («...Забыць Герастрата!» Р.Горына), Мішо («Уцёкі з ночы» бр. Тур), Маляр («Трэцяе жаданне» Б.Блажака),



З.Ф.**Стома**.



М.В.**Сторажаў**.

доктар Камін («Зоркі вечныя» М.Бора). Зняўся ў кінафільмах «Чырвонае лісце», «Міколка-паравоз», «Канстанцін Заслонаў», «Гадзіннік спыніўся апоўначы», «Я, Францыск Скарына», «Запомнім гэты дзень», «Белы цень» і інш., тэлефільмах «Руіны страляюць...», «Нас выбраў час» і інш.

Літ.: Гаўрук Ю. Здзіслаў Стома // Слова пра майстроў сцэны. Мн., 1967; Гороб-



З.**Стома** ў ролі пана Быкоўскага.

ченко Т. Служение искусству // Неман. 1982. № 8; Астапенка А. Нявольнік Мельпамены: Дак. аповесць пра народнага артыста СССР Здзіслава Стому. Мн., 1991.

В.А.Ракіцкі.

СТО́МЛЕНАСЦЬ у фізіялогіі, часовае паніжэнне працаздольнасці пад уздзеяннем інтэнсіўнай або працяглай працы. Памяншаецца сіла і трываласць мышцаў, пагаршаюцца каардынацыя рухаў, памяць, павялічваюцца затраты энергіі, запавольваецца хуткасць перапрацоўкі інфармацыі, ускладняецца працэс канцэнтравання і пераключэння ўвагі. Крытэрыі С. — стан фізіял. функцый, колькасныя і якасныя паказчыкі працы. Развіваецца С. напачатку ў розных аддзелах ц.н.с., найперш у клетках кары вял. паўшар'яў галаўнога мозга, і звязана з парушэннем дынамічнай раўнавагі працэсаў узбуджэння і тармажэння. У мышачнай сістэме ўзнікае ў выніку памяншэння запасаў энергет. рэчываў і назапашвання прадуктаў распаду. Ліквідуецца зменай віду працы, адпачынкам, сном; пры адсутнасці змен пераходзіць у паталаг. стан — ператамленне.

Літ.: Зинченко В.П., Леонова А.Б., Стрелков Ю.К. Психометрика утомления. М., 1977.

С.С.Ермакова.

СТО́МЛЕНАСЦЬ МАТЭРЫЯЛАЎ, змена механічных і фізічных уласцівасцей матэрыялаў у выніку ўздзеяння шматразовых знакаперамённых (цыклічных) або адназначных, часта вібрацыйных нагрузак, якое прыводзіць да іх прагрэсіруючага *разбурэння*.

Залежыць ад зыходнай трываласці, пластычнасці, вязкасці, цвёрдасці, макра- і мікраструктуры, віду нагрузкі, астаткавых напружанняў і інш. Супраціўленне С.м. характарызуецца мяжой *вынослівасці* — найб. напружаннем, якое можа атрымаць матэрыял без разбурэння пры зададзенай колькасці цыклічных уздзеянняў. Залежнасць паміж колькасцю цыклаў і стадый пашкоджання (у т.л. ўзнікненне шчылін, канчатковае разбурэнне) выражаецца графічна.

Л.А.Сасноўскі.

СТО́НХЕНДЖ (Stonehenge), адно з буйнейшых *мегалітычных збудаванняў*, найб. знакаміты брытанскі хендж, унікальны ў архітэктурных адносінах. Знаходзіцца каля г. Солсберы (Вялікабрытанія), абкружаны комплексам курганных могільнікаў і рытуальных помнікаў. Складаецца з 3 збудаванняў, узведзеных на адным і тым жа месцы ў розныя часы. Першае мае акруглую форму дыям. 115, 8 м. Складалася з рова і ўнутр. вала, парушанага праходам. З унутр. боку вала знаходзілася кола з 56 ям (т.зв. ямы Обры), у некаторых з іх былі рэшткі крэмацыі. Датуецца 2180 ± 105—1848 ± ± 275 да н.э. Другое збудаванне складалася з 2 канцэнтрычных колаў вертыкальна пастаўленых 82 блокаў блакітных камянёў у цэнтры стараж. вала. Да яго ідзе «шлях» з 2 паралельных валоў і рова (т.зв. «Авеню»). Датуецца 1720 ± ± 150—1620 ± 110 да н.э. Трэцяе збудаванне складалася з вертыкальна пастаўленых адшліфаваных сарсенавых блокаў выш. 8,5 м і масаю больш за 20 т кожны, на якія зверху былі пакладзены пліты. Збудаванне ўяўляла сабой замкнё-

нае кола дыям. 30 м вакол 5 трылітаў (2 камяні, зверху перакрытыя каменнай плітой), якія абкружалі ляжачы гарызантальна т.зв. алтарны камень. На адным з блокаў выразана выява кінжала, на шматлікіх — сякеры, датуецца 1500—1400 да н.э. Апошняя стадыя існавання С. датуецца 1240 ±105 да н.э. Лічаць, што С. з'яўлялася не толькі храмам, магчыма, звязаным з культам сонца, але і адной са старажытнейшых астранамічных абсерваторый. С. уключаны ЮНЕСКА у спіс *Сусветнай спадчыны*. Іл. гл. таксама да арт. *Мегалітычныя збудаванні*. *Т.С.Скрыпчанка.*

СТО́ПАК, герой бел. нар. казкі «Мужык і пан». Хітры і кемлівы прыгонны селянін, які адважыўся пайсці да пана-самадура і расказаць яму пра ўсе беды ў панскім двары. Умелым і дасціпным апавяданнем С. давёў пана да адчаю, адпомсціўшы за ўсе здзекі і пакуты. На Беларусі вядома 6 варыянтаў казкі.

СТОП-КАДР, адзін з прыёмаў кінематаграфічнай перадачы падзей, пры якім узнікае эфект спынення экраннай выявы ў руху. Дасягаецца шляхам шматразовага паўтору на плёнцы аднаго і таго ж кадрыка, што дазваляе акцэнтаваць пэўны момант дзеяння, якое адлюстроўваецца. С.-к. можа служыць для завяршэння эпізоду ці фільма (падкрэслівае фінальны акцэнт).

СТОП-КРАН, тармазны кран, што служыць для прывядзення ў дзеянне тармазоў пры экстранным спыненні цягніка. Устанаўліваецца ў грузавых і пасаж. вагонах.

СТО́РАЖАВА Людміла Іванаўна (н. 7.2.1925, г. Кіраў, Расія), бел. актрыса. Засл. арт. Беларусі (1966). Скончыла студыю пры Грозненскім рус. драм. т-ры (1945). Працавала у т-рах Грознага, Чэркеска, Клайпеды (1944—59), Арла (1974—81). З 1959 у Брэсцкім, з 1962 у Гродзенскім, у 1968—74 у Гомельскім абл. драм. т-рах. Выканаўца драм. і характарных роляў, творчасці ўласціва адчуванне часу і стылю драматург. твора, рамант. прыўзнятасць. Сярод роляў у Брэсцкім т-ры: Ганна Карэніна (аднайм. п'еса паводле Л.Талстога), Ірына («Тры сястры» А.Чэхава), Джудзіт («Вучань д'ябла» Б.Шоу), Катрын («Від з моста» А.Мілера); у Гродзенскім т-ры: Манахава («Варвары» М.Горкага), Клеапатра («Антоній і Клеапатра» У.Шэкспіра), Гарэцкая («Першы ўрок» К.Губарэвіча); у Гомельскім т-ры: Параска («Рудабельская рэспубліка» паводле С.Грахоўскага), Хрысціна («Грэшнае каханне» А.Дзялендзіка), Кукушкіна, Агудалава («Даходнае месца», «Беспасажніца» А.Астроўскага).

СТО́РАЖАЎ Мікалай Васілевіч (н. 8.8.1934, с. Стары Вышкаў Навазыбкаўскага р-на Бранскай вобл., Расія), бел. юрыст. Чл.-кар. Нац. АН Беларусі (з 1989), д-р юрыд. н. (1978), праф. (1985). Скончыў БДУ (1959). З 1964 у Ін-це філасофіі і права АН Беларусі (з 1978 заг. сектара, з 1986 заг. аддзела); адначасова ў 1980—84 праф. Бел. ун-та культуры, у 1987—88 Бел. эканам. ун-та, з 1993 БДУ. Навук. працы ў галіне агр. і экалаг. права. Даследаваў праблемы развіцця і ўдасканалення агр., зямельнага і экалаг. заканадаўства, прававога становішча с.-г. прадпрыемстваў. Адзін з аўтараў «Гісторыі дзяржавы і права Беларускай ССР» (т. 1—2, 1970—76). Удзельнічаў у распрацоўцы шэрагу заканад. актаў.

Тв.: Правовое положение колхоза на современном этапе. Мн., 1975; Правовой режим мелиорированных земель. Мн., 1986; Совершенствование сельскохозяйственного законодательства (разам з І.Ф.Казьміным) // Совершенствование законодательства Союза ССР и союзной республики. Мн., 1990.

СТО́РАНЫ ГАРЫЗО́НТУ, тое, што *кірункі свету*.

СТО́РНА (ад італьян. storno перавод рахунка), 1) спосаб выпраўлення памылак у бухгалтарскім уліку, які заключаецца ў тым, што памылкова ўнесеную аперацыю запісваюць чырвоным чарнілам («чырвонае сторна») і выключаюць з канчатковай сумы рахунка. 2) Паказчык, які характарызуе змяншэнне страхавога партфеля дзеючых дагавораў доўгатэрміновага страхавання жыцця на пэўную справаздачную дату.

СТО́РЦІНГ (storting), назва парламента ў Нарвегіі. Працай С. кіруюць яго прэзідэнт і віцэ-прэзідэнт, якія разам з прэзідэнтамі і віцэ-прэзідэнтамі абедзвюх палат С. (лагцінга і одэльсцінга) утвараюць прэзідэнцкі савет. С. зацвярджае дзярж. бюджэт, прымае законы, ратыфікуе міжнар. дагаворы, ажыццяўляе кантроль за дзейнасцю ўрада і інш. Гл. таксама раздзел пра дзярж. лад у арт. *Нарвегія*.

СТО́ЎБЦЫ, горад, цэнтр Стаўбцоўскага р-на Мінскай вобл., на правым беразе р. Нёман. Чыг. ст. на лініі Мінск—Брэст. Каля шашы Мінск—Брэст, вузел аўтадарог на Мір, Івянец, Рубяжэвічы, Нясвіж. За 78 км на ПдЗ ад Мінска. 16,8 тыс. ж. (2001).

Паводле некаторых звестак, вядомы з 1511. У пач. 17 ст. мястэчка Мінскага пав., уласнасць А.Слушкі, які заснаваў *Стаўбцоўскі кляштар дамініканцаў*. У 1655 у час вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—67 разрабаваны і спалены, у 1706 у час Паўн. вайны 1700—21 моцна разбураны, але хутка аднаўляліся і атрымлівалі пацвярджэнне на таргі і кірмашы. З пач. 18 ст. ўласнасць С.Дэнгафа, з 1728 — Чартарыйскіх, цэнтр графства, 144 двары, царква, касцёл (з 1623), ратуша, школа і



Горад **Стоўбцы**. Рэстаран «Нёман».

кляштар са шпіталём, карчма, буйная рачная прыстань з 16 складамі. У 1729 мястэчка атрымала магдэбургскае права. З 1793 у Рас. імперыі, з 1796 цэнтр воласці Мінскага пав. У вайну 1812 моцна пацярпелі. З 1831 дзярж. ўласнасць. У 1871 за 2 км ад С. заснавана аднайм. станцыя на чыг. Масква—Брэст. У 1886 у С. 1070 ж., 186 двароў, 2 царквы, сінагога, 2 яўр. малітоўныя дамы, школа, 20 крам; у 1897 на станцыі 120 ж., 8 двароў. З 1921 у Польшчы, горад, цэнтр гміны і *Стаўбцоўскага павета* ў Навагрудскім ваяв., 2956 ж. У 1931 арганізавана *Беларускае таварыства дабрачыннасці*. З 1939 у БССР, з 1940 цэнтр *Стаўбцоўскага раёна*. У Вял. Айч. вайну з 28.6.1941 да 2.7.1944 акупіраваны ням. фашыстамі, якія загубілі ў С. і раёне 4,9 тыс. жыхароў. У 1989 — 12,1 тыс. жыхароў.

Працуюць хлебны, малочны, садавіна-агароднінны, мех. з-ды, дрэваапр. камбінат, фірма «Аграмашзапчастка», камбінат быт. паслуг; 3 сярэднія, вячэрняя, пач., спарт. школы, школа мастацтваў, Дом дзіцячай і юнацкай творчасці, Дом культуры, карцінная галерэя, 2 б-кі, кінатэатр, бальніца, паліклініка. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан, магілы ахвяр фашызму. Помнікі: Вызвалення, Ф.Э.Дзяржынскаму. Мемарыяльная сядзіба Я.Коласа ў Акінчыцах — частка *Коласа Якуба літаратурна-мемарыяльнага музея філіяла*. Помнік архітэктуры — царква Святой Ганны (1825).



Стонхендж. Агульны выгляд.

Літ.: Деленковский Н.И., Турко А.М. Столбцы: Ист.-экон. очерк. Мн., 1981.

С.А.Галоўка.

СТОЎН (Stone) Ірвінг (14.7.1903, г. Сан-Францыска, ЗША — 26.8.1989), амерыканскі пісьменнік; стваральнік новага тыпу біяграфіі ў амер. л-ры. Скончыў Каліфарнійскі ун-т. Літ. дзейнасць пачаў у 1930-я г. Аўтар раманізаваных біяграфій «Прага да жыцця» (1934, пра В. ван Гога), «Марак у сядле» (1938, пра Дж.Лондана), «Абарона Кларэнс Дэроу» (1941), «Яны таксама балаціраваліся» (1943), «Эл Уорэн» (1948), «Паходжанне. Біяграфічны раман пра Ч.Дарвіна» (1980) і біягр. раманаў «Бессмяротная жонка» (1944), «Працаўнік у доме» (1947), «Жанчына прэзідэнта» (1951), «Каханне вечнае» (1954), «Пакуты і радасці» (1961, пра Мікеланджэла), «Тыя, хто любяць» (1965), «Страсці розуму» (1971, пра З.Фрэйда), «Грэчаскі скарб» (1975) і інш., адметных гіст. і псіхал. дакладнасцю.

Тв.: Рус. пер. — Моряк в седле. Мн., 1984; Жажда жизни. Мн., 1987; Страсти ума, или Жизнь Фрейда. М., 1999.

Літ.: Комаровская Т.Е. Творчество Ирвинга Стоуна. Мн., 1983.

Т.Я.Камароўская.

СТОЎН (Stone) Рычард (Джон Рычард Нікалас; 30.8.1913, Лондан — 6.12.1991), англійскі вучоны-эканаміст. Скончыў



Р.Стоўн.

Кембрыджскі ун-т (1935) і працаваў у ім з 1945 (з 1955 праф.). Стварыў сістэму *нацыянальных рахункаў*, асн. прынцыпы якой вызначылі практыку складання нац. рахункаў у большасці краін свету. Распрацаваў метады вылічэння нац. рахункаў у рэальных велічынях і скарыстаў іх для пабудовы паслядоўных індэксаў цэн і аб'ёму вытв-сці. У працы «Нацыянальны даход і дзяржаўныя расходы» (1944 з Дж.Э.Мідам) прапанаваў методыку вылічэння нац. даходу, якая адрознівалася ад папярэдніх спроб улікам звестак пра даходы і расходы ўсіх сектараў эканомікі. Стварыў сістэму дэмаграфічных разлікаў, якая ўключала фактары змены дынамікі народанасельніцтва і сац.-эканам. пераменныя («Да сістэмы сацыяльнай і дэмаграфічнай статыстыкі», 1975). Значны ўклад яго ў вывучэнне паводзін спажыўца, структуры спажывецкіх расходаў і ашчаджэнняў («Аналіз рыначнага попыту», 1945). Распрацаваў эканаметрычныя мадэлі эканам. росту. Нобелеўская прэмія 1984.

Тв.: Рус. пер. — Метод «затраты—выпуск» и национальные счета. М., 1966; Моделирование экономических систем // Экономика и математические методы. М., 1965. Т. 1, вып. 3—4; Применение метода баланса к статистике населения как средство планирования народного образования // Там жа. 1967. Т. 3, вып. 3; Экономические и демографические счета и распределение доходов // Там жа. 1971. Т. 7, вып. 5.

СТО́ЎПНЯ, вёска ў Рагачоўскім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета і с.-г. вытв. кааператыва. За 39 км на ПдУ ад г. Рагачоў, 82 км ад Гомеля, 18 км ад чыг. ст. Салтанаўка. 470 ж., 152 двары (2001). Сярэдняя школа, Палац культуры, б-ка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан.

СТО́ХЕЛЬ (Stochel) Уладзімеж (н. 8.3.1945, в. Макаў Малапольскага ваяв., Польшча), польскі літаратуразнавец. Канд. філал. н. (1975). Скончыў Варшаўскі ун-т (1969). З 1973 у Ін-це славяназнаўства Польскай АН (у 1978—82 заг. сектара ўсх.-слав. л-р, у 1988—90 нам. дырэктара), з 1997 у Ін-це ўсх. славяназнаўства пры Вармінска-Мазурскім ун-це (г. Ольштын). Даследуе гісторыю бел. л-ры 19 — пач. 20 ст., узаемасувязі бел. і польскай л-р. Аўтар арт. «Студзеньскае паўстанне ў беларускай літаратуры» (1972), «Янка Купала, Адам Міцкевіч і Тарас Шаўчэнка» (1973), «Польская, руская і ўкраінская літаратура на старонках «Нашай нівы» (1974), «Адам Міцкевіч, Аляксандр Пушкін і Тарас Шаўчэнка ў беларускай літаратуры 1863—1917 гг.» (1976), «Янка Купала і Станіслаў Пшыбышэўскі» (1981), «Сучаснае польскае літаратуразнаўства пра польска-беларускія літаратурныя ўзаемаадносіны» (1989), «Янка Купала і традыцыі міцкевічаўскага рамантызму» (2000) і інш. Выступае з артыкуламі пра творчасць М.Танка, В.Быкава, рэцэнзіямі на літ.-знаўчыя работы бел. даследчыкаў. Сааўтар «Бібліяграфіі польскай русістыкі, 1945—1975. Літаратуразнаўства» (1976). Адзін з перакладчыкаў на польскую мову «Гісторыі рускай савецкай літаратуры» (1977).

В.С.Семенякоў.

СТРАБАСКАПІ́ЧНЫ ЭФЕ́КТ, з'ява ўспрымання нерухомым рухомага аб'екта пры ўмове перарывістага яго назірання, а таксама ўспрымання хуткай змены відарысаў асобных момантаў (паслядоўных фаз) руху цела як неперарыўнага яго руху; адна са зрокавых *ілюзій*. Грунтуецца на інерцыі зроку — захаванні ў памяці ўспрынятага зрокавага вобраза на кароткі час (да 0,1 с) пасля знікнення аб'екта, які выклікаў гэты вобраз. Выкарыстоўваецца ў *страбаскапічных прыладах*, кінематаграфіі і тэлебачанні.

СТРАБАСКАПІ́ЧНЫЯ ПРЫЛА́ДЫ, дэманстрацыйныя ці кантрольна-вымяральныя прылады, прынцып дзеяння якіх грунтуецца на *страбаскапічным эфекце*. Прызначаны для назірання хуткіх вярчальных або вагальных рухаў цела. Даюць магчымасць вымяраць скорасць аб'екта без мех. кантакту з ім.

Бываюць оптыка-мех., эл.-аптычныя, электронныя і інш. У оптыка-мех. С.п. (стробатахометраў) перыяд. перарыванне святла ажыццяўляецца абтуратарам, у эл.-аптычных — аптычнымі затворамі, прынцып дзеяння якіх заснаваны, напр., на *Кера эфекце*, у электронных — імпульснымі крыніцамі святла, якімі кіруюць з дапамогай спец. генератараў. Пры даследаваннях перыяд. электронных працэсаў карыстаюцца асцылаграфічнымі С.п., стробарэзанаснымі гальванометрамі і інш. Існуюць С.п., якія працуюць у інш. дыяпазонах эл.-магн. выпрамянення. Напр., для назірання за работай клапанаў сэрца карыстаюцца рэнтгена-імпульснымі С.п.

СТРАБАСКО́П (ад грэч. strobos кружэнне, бязладны рух + *...скоп*), дэманстрацыйная ці кантрольна-вымяральная прылада, прынцып дзеяння якой грунтуецца на *страбаскапічным эфекце*.



Схема дыскавага **страбаскопа**.

У дэманстрацыйных С. відарысы (рысункі, фатаграфіі) паслядоўных фаз руху якога-н. аб'екта размяшчаюцца на дыску (найб. пашырана), барабане ці папяровай стужцы. Пры хуткай змене гэтых відарысаў у назіральніка, які бачыць іх праз вузкія шчыліны, ствараецца ўражанне неперарыўнага руху аб'екта. Удасканаленыя дэманстрацыйныя С. былі папярэднікамі кінематографа. Кантрольна-вымяральныя С. маюць імпульсную крыніцу святла. Калі частата імпульсаў святла супадае, напр., з перыядам вярчэння аб'екта, то ствараецца ўражанне, што аб'ект нерухомы. Пры невял. рознасці гэтых частот здаецца, што аб'ект рухаецца павольна. Гл. таксама *Страбаскапічныя прылады*.

СТРАБІ́РАВАННЕ (англ. strobing ад strobe пасылаць выбіральныя імпульсы, ад грэч. strobos кружэнне, бязладны рух), метад вылучэння з паслядоўнасці імпульсаў толькі тых, якія адрозніваюцца пэўнымі прыкметамі (амплітудай, працягласцю, становішчам на часавай восі і інш.). Ажыццяўляецца падачай на схемы супадзенняў (гл. *Супадзенняў метад*) строб-імпульсаў, якія прапускаюць у наступныя эл. ланцугі імпульсы з выбранай прыкметай. Выкарыстоўваецца ў радыёлакацыі, імпульснай радыёсувязі, выліч. тэхніцы, тэлебачанні і інш.

СТРАБО́Н [Strabōn; 64/63 да н.э., г. Амасья (цяпер Турцыя) — 23/24 н.э.], старажытнагрэчаскі географ і гісторык. Атрымаў філасофскую адукацыю. Падарожнічаў па Грэцыі, М. Азіі, Італіі, Егіпце. Аўтар «Гістарычных запісак» (не захаваліся), створаных як працяг «Гісторыі» *Палібія* (апісаны падзеі 146—31 да н.э.), і «Геаграфіі», у якой абагульніў і супаставіў усе вядомыя на яго час звесткі па геаграфіі. 1-я і 2-я кнігі «Геаграфіі» прысвечаны матэм. геаграфіі, 3—10-я — Еўропе, 11—16-я — Азіі, 17-я — Афрыцы; у кнізе ёсць звесткі па гісторыі паўд. тэрыторый Расіі, Украіны, Грузіі, Арменіі, Азербайджана і Паўн. Каўказа. Лічыў Гамера аўтарытэтам у галіне геаграфіі. Выкарыстоўваў лакальныя гіст. і геагр. працы, асабліва звесткі гісторыкаў Мітрыдатавых войнаў. У працах С. багаты факталагічны матэрыял па гісторыі, геаграфіі, этнаграфіі ант. свету.

Тв.: Рус. пер. — География. М., 1964.

Літ.: Арский Ф.Н. Страбон. М., 1974.

А.Г.Зельскі.

СТРАВАВА́ЛЬНАЯ СІСТЭ́МА, сукупнасць органаў *стрававання* ў жывёл і чалавека, якія забяспечваюць мех. і хім. апрацоўку ежы, усмоктванне яе састаўных ч. і выдзяленне незасвоеных рэшткаў. У пазваночных С.с. ўключае ротавую поласць, глотку, стрававод, *страўнік*, *кішэчнік*, буйныя стрававальныя залозы (*печань*, *падстраўнікавая залоза*). У раслінаедных адзначаецца значная даўж. кішэчніка, асабліва тоўстага (напр., у коней з'яўляюцца дадатковыя сляпыя адросткі), у кароў страўнік мае 4 камеры, у драпежных кішэчнік карацейшы, страўнік аднакамерны. Розныя аддзелы С.с. выконваюць спецыфічныя функцыі ў працэсе бесперапыннага ператраўлення ежы (напр., хім. працэс стрававання і ўсмоктвання ў страўніку і тонкай кішцы), таксама нестрававальныя функцыі (напр., выдзяляльныя органаў, эндакрынных залоз, імунныя).

А.С.Леанцюк.



Стрававальная сістэма чалавека: 1 — язык; 2 — поласць рота; 3 — мяккае нёба; 4 — глотка; 5 — стрававод; 6 — страўнік; 7 — падстраўнікавая залоза; 8 — брыжэечная частка тонкай кішкі; 9 — тоўстая кішка; 10 — 12-персная кішка; 11 — печань.

СТРАВАВА́ЛЬНЫ СОК, тое, што *кішэчны сок*.

СТРАВАВА́ННЕ, сукупнасць працэсаў, што забяспечваюць мех. драбненне і хім. (пераважна ферментатыўнае) расшчапленне харч. рэчываў на кампаненты, прыдатныя да ўсмоктвання і ўдзелу ў абмене рэчываў. Адрозніваюць 3 асн. тыпы. Пры ў н у т р ы к л е т а ч н ы м С. харч. субстрат паступае ўнутр клеткі, дзе гідралізуецца ферментамі цытаплазмы або пры ўдзеле лізасом, а таксама ва ўнутрыклетачных поласцях — стрававальных вакуолях (гл. *Пінацытоз*, *Фагацытоз*). Пашырана ў аднаклетачных, некат. ніжэйшых мнагаклетачных і ў вышэйшых жывёл. П а з а к л е т а ч н а е, або дыстантнае, С. характарызуецца тым, што ферменты, якія сінтэзуюцца ў клетках, выдзяляюцца ў знешняе асяроддзе і гідралізуюць харч. рэчывы. Пашырана ў кішачнаполасцевых, ракападобных, насякомых і інш. У вышэйшых мнагаклетачных адбываецца ў поласцях стрававальна-кішачнага тракту (поласцевае С.). М е м б р а н н а е, або прысценачнае, С. ажыццяўляецца ферментамі, лакалізаванымі на структурах клетачнай мембраны, звычайна на паверхні кішэчных клетак. Уласціва многім беспазваночным і ўсім пазваночным жывёлам. У норме ў працэсах С. важную ролю адыгрываюць мікраарганізмы, а ў некат. жывёл прасцейшыя, што насяляюць розныя аддзелы *стрававальнай сістэмы*. У роце адбываецца пераважна мех. драбненне ежы і змочванне яе слінай; у *страўніку* — кіслотная дэнатурацыя бялковых кампанентаў ежы і пачатковыя стадыі гідролізу бялкоў; найб. інтэнсіўныя працэсы расшчаплення (з удзелам ферментаў *падстраўнікавай залозы*, солей жоўцевых к-т) і ўсмоктвання канчатковых прадуктаў — у тонкай кішцы. Асн. канечнымі прадуктамі расшчаплення бялкоў з'яўляюцца амінакіслоты, тлушчаў — гліцэрын і тлустыя к-ты, вугляводаў — монацукрыды. Пасля ўсмоктвання з іх у органах і тканках зноў сінтэзуюцца складаныя, спецыфічныя для арганізма злучэнні. У тоўстай кішцы С. звычайна адсутнічае, а адбываецца інтэнсіўнае ўсмоктванне вады, электралітаў, глюкозы, некат. вітамінаў і амінакіслот, якія выпрацоўвае кішэчная *мікрафлора*. Па меры прасоўвання і ўшчыльнення змесціва *кішэчніка* фарміруецца кал, назапашванне якога выклікае акт *дэфекацыі*. Дзейнасць органаў С. кантралюецца вегетатыўнай нерв. сістэмай і гумаральнымі фактарамі.

Літ.: Уголев А.М. Эволюция пищеварения и принципы эволюции функций. Л., 1985; Я г о ж. Теория адекватного питания и трофология. СПб., 1991.

А.С.Леанцюк.

СТРАВІ́НСКІ Густаў (псеўд. М л о т а к; 1837, Ваўкавыскі пав. — 1905), адзін з кіраўнікоў *паўстання 1863—64* на Беларусі. Былы вайсковец. Вясной 1863 сфарміраваў і ўзначаліў Ваўкавыскі паўстанцкі атрад, 14.5.1863 удзельнічаў у баі супраць урадавых войск у Міхалінскіх лясах (паблізу г. Бяроза Брэсцкай вобл.). 3.6.1863 разам з Гродзенскім атрадам А.*Лянкевіча* ўдзельнічаў у *Міла-відскай бітве 1863*. Некаторы час пры атрадзе С. знаходзіўся гал. штаб Гродзенскага ваяв. на чале з А.Духінскім і В.*Урублеўскім*. У жн. 1863 прызначаны Урублеўскім ваен. начальнікам Ваўкавыскага пав. Увосень 1863 распусціў свой атрад і выехаў за мяжу. *Г.В.Кісялёў.*

СТРАВІ́НСКІ Ігар Фёдаравіч (17.6.1882, г. Ламаносаў Ленінградскай вобл. — 6.4.1971), расійскі кампазітар, дырыжор, адзін з буйнейшых кампазітараў 20 ст. Сын Ф.І.*Стравінскага*. Вучыўся ў Пецярбургскім ун-це (1900—05). Вучань М.*Рымскага-Корсакава*. З 1914 за мяжой (Швейцарыя, Францыя, з 1939 ЗША). Для С. характэрны яскравы талент, нац. творчае мысленне, наватарства ў сістэмнай арганізацыі муз. матэрыялу. У сваёй творчай эвалюцыі пераходзіў ад захаплення рус. тэматыкай і муз. фальклорам, стварэння музыкі на аснове стылізацыі розных муз. з'яў мінулага да неакласіцызму. Аддаўшы даніну амаль усім плыням сучаснага муз. мастацтва, розным маст. сістэмам, стварыў уласны стыль, які выяўляецца ў формаўтварэнні, тэматызме, метрарытміцы, інструментоўцы і інш. Сярод твораў: оперы «Салавей» (паст. 1914), «Маўра» (паст. 1922), «Прыгоды гулякі» (паст. 1951), опера-араторыя «Цар Эдып» (паст. 1927; 2-я рэд. 1948); балеты і харэагр. сцэны, у т.л. «Жар-птушка» (паст. 1910), «Пятрушка» (паст. 1911), «Вясна свяшчэнная» (паст. 1913), «Гісторыя салдата» (паст. 1918), «Пульчынела» (паст. 1920), «Байка пра Лісу, Пеўня,Ката ды Барана» (паст. 1922), «Вяселейка» (паст. 1923), «Апалон Мусагет» і «Пацалунак феі» (абодва паст. 1928), «Гульня ў карты» (паст. 1937), «Арфей» (паст. 1948), «Агон» (паст. 1957); Сімфонія псалмоў для хору і арк. (1930), 3 сімфоніі (1907, 1940, 1945); творы для камернага арк., асобных інструментаў з арк., камерна-інстр., для голасу з суправаджэннем і інш. На сцэне Нац. акад. т-ра балета Беларусі паст. балеты «Вясна свяшчэнная» (1986, 1997), «Жар-птушка» (1998), «Пацалунак феі» (1999).

Літ. тв.: Рус. пер. — Хроника моей жизни. Л., 1963; Диалоги. Воспоминания. Размышления. Комментарии. Л., 1971; Статьи и материалы. М., 1973; И.Стравинский — публицист и собеседник. М., 1988.

Літ.: Смирнов В. Творческое формирование И.Ф.Стравинского. Л., 1970; Асафьев Б.В. Книга о Стравинском. Л., 1977;

Стравинская К.Ю. О И.Ф.Стравинском и его близких. Л., 1978; Друскин М. Игорь Стравинский: Личность, творчество, взгляды. 3 изд. Л., 1982; Ярустовский Б.М. И.Стравинский. 3 изд. Л., 1982.
Т.А.Дубкова.

СТРАВІ́НСКІ Фёдар Ігнатавіч (20.6.1843, маёнтак Новы Двор, Рэчыцкі пав. Мінскай губ. — 4.12.1902), рускі спявак (бас).



І.Ф.**Стравінскі**.



Ф.І.**Стравінскі**.

Скончыў гімназію ў Мазыры (1865, у час вучобы спяваў у студэнцкіх спектаклях, зборы ад якіх ішлі матэрыяльна незабяспечаным гімназістам), Пецярбургскую кансерваторыю (1873). Саліст Кіеўскага (з 1873), Марыінскага (з 1876) оперных т-раў. На сцэне апошняга выканаў больш за 60 рознахарактарных партый у операх рус. і замежных кампазітараў. Сярод лепшых роляў: Фарлаф («Руслан і Людміла» М.Глінкі), Варлам і Рангоні («Барыс Гадуноў» М.Мусаргскага), Яромка, Алаферн («Варожая сіла», «Юдзіф» А.Сярова), Млынар («Русалка» А.Даргамыжскага), Дон Базіліо і Бартола («Севільскі цырульнік» Дж.Расіні), Спарафучыле («Рыгалета» Дж.Вердзі), Сен-Бры і Марсель («Гугеноты» Дж.Меербера), Мефістофель («Фауст» Ш.Гуно) і інш. С. валодаў яркім сцэнічным талентам, майстэрствам пераўвасаблення, найб. ўвагу аддаваў акцёрскаму ўдасканаленню, сам ствараў эскізы грыму да роляў. Выканальніцкая дзейнасць С., які прадоўжыў традыцыі В.*Пятрова* і прадвызначыў творчы шлях Ф.*Шаляпіна*, стала значным этапам у гісторыі рус. опернага мастацтва.

Літ.: Ф.Стравинский: Статьи, письма, воспоминания. Л., 1972.
Т.Г.Слабодчыкава.

СТРАВІ́НСКІЯ, шляхецкі род герба «Суліма» ў ВКЛ. Упамінаюцца з 1500. Найб. вядомыя:

Марцін (?—1594), цівун і гарадніч троккі, маршалак гаспадарскі ў 1580—90, кашталян менскі ў 1590—92 і віцебскі з 1592. Меў сына Гераніма Максіміляна, старосту рагачоўскага. Бальцар (Бальтазар; ?—1633), брат Марціна, цівун троккі, кашталян берасцейскі ў 1624—27 і смаленскі ў 1627—31, ваявода менскі з 1631. Неаднаразова выбіраўся паслом на соймы. Эразм, брат Марціна, палкоўнік каралеўскі, падкаморы ноўгарад-северскі. Крыштоф, брат Марціна, суддзя земскі троккі. Пакінуў сыноў Казіміра, канюшага троккага, Караля, падкаморыя старадубскага, Збігнева, суддзю старадубскага, Максіміляна, стольніка старадубскага, Траяна, суддзю гродскага ашмянскага, Крыштофа, чашніка ашмянскага. Францішак, войскі старадубскі, суддзя гродскі пінскі, пасол на элекцыйны сойм 1679. Ігнацы (?—1787), староста слонімскі ў 1762—75, падканюшы ВКЛ з 1771. З гэтага роду паходзілі бацька і сын — Ф.І.*Стравінскі*, спявак, І.Ф.*Стравінскі*, кампазітар. Вядомы таксама роды С. гербаў «Даліва», «Гіпацэнтаўр», «Прыяцель».
М.І.Краснодуб.

«СТРАДА́ННІ», бел. бытавы парна-масавы танец рус. паходжання. Муз. памер 2/4. Тэмп умераны. Мае своеасаблівы лірычны характар. Выконваецца па крузе любой колькасцю пар, часта пад прыпеўкі. Складаецца з некалькіх простых фігур: крок з прытупам, пераходы партнёраў, кружэнне пар. Існуе ў розных варыянтах. На Беларусі вядомы ў Гомельскай, Магілёўскай і Мінскай абл.

СТРА́ДАНЬ, возера ў Полацкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Дрыса, за 32 км на ПнУ ад г. Полацк, сярод парослага лесам і хмызняком вярховага балота. Пл. 0,57 км^2, даўж. каля 1,1 км, найб. шыр. 760 м, найб. глыб. 2,9 м, даўж. берагавой лініі 3,8 км. Пл. вадазбору 2,5 км^2. Катлавіна рэшткавага тыпу. Схілы невыразныя. Берагі выш. да 0,5 м, тарфяныя, на мысах пясчаныя, пад лесам, у залівах сплавінныя. Дно плоскае, сапрапелістае. Вада нізкай мінералізацыі (65 мг/л), з высокай колернасцю. Зарастае да глыб. 1,7 м. Шырыня прыбярэжнай паласы трысняг і чароту 30—80 м. Сцёк па р. Марынец.

СТРА́ДНАЕ ВО́ЗЕРА. У Верхнядзвінскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Свольна, за 38 км на ПнУ ад г. Верхнядзвінск. Пл. 0,94 км^2, даўж. больш за 1,4 км, найб. шыр. 1,1 км, найб. глыб. 1,1 м, даўж. берагавой лініі 4,5 км. Пл. вадазбору 16,8 км^2. Катлавіна рэшткавага тыпу. Схілы выш. да 2 м, разараныя. Берагі нізкія, пясчаныя, месцамі тарфяныя. Пойма шыр. 50—300 м, забалочаная, пад хмызняком. Дно плоскае, каля паўд. і ўсх. берагоў да глыб. 0,5 выслана пяском і апясчаненым ілам, астатняя ч. — сапрапелем. Зарастае падводнай расліннасцю, уздоўж берагоў перарывістая паласа надводнай расліннасці шыр. да 75 м, пашырана да глыб. 0,5 м. Упадае р. Балгач, сцёк па р. Трудніца.

СТРА́ДУБКА, вёска ў Лоеўскім р-не Гомельскай вобл., на правым беразе р. Дняпро. Цэнтр сельсавета і камунальнага с.-г. унітарнага прадпрыемства. За 28 км на ПнЗ ад г.п. Лоеў, 72 км ад Гомеля, 39 км ад чыг. ст. Рэчыца. 570 ж., 244 двары (2001). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі.

СТРАДЫВА́РЫ, Страдыварыус (Stradivari, Stradivarius), сям'я італьянскіх майстроў смыкавых інструментаў 17—18 ст. Працавалі ў г. Крэмона. Антоніо С. (1644?—18.12.1737), адзін з найб. выдатных прадстаўнікоў сям'і. Вучань Н.*Амаці*. З 1660 працаваў у стылі Амаці, на той час меў кляймо «Antonius Stradivarius Cremonensis Alumnus Nicolaij Amati» («Антоніо Страдывары Крэмонскі вучань Нікола Амаці»), у 1667 адкрыў сваю майстэрню. 1700—16 — т.зв. «залаты перыяд» у творчасці, у 1703 стварыў класічную мадэль скрыпкі «Гранд Страдывары». Ствараў найлепшыя па канцэртных якасцях інструменты (скрыпкі, альты, віяланчэлі, гітары), наблізіў іх да тэмбру прыроднага чал. голасу (з амаль 2500 інструментаў захавалася каля 1000, якія сталі класічнымі ўзорамі для майстроў пазнейшага часу). Для іх уласцівы дасканалая форма, ювелірная апрацоўка дэталей, моцны, багаты тэмбравымі фарбамі гук. Сярод вучняў яго сыны Франчэска С. (1.11.1671—15.1 або 11.5.1743) і Амабона С. (14.11.1679—9.6.1742), якія часта працавалі разам, а таксама К.Бергонцы. Сумесна створаныя імі скрыпкі мелі кляймо «Sotto la Disciplina d'Antonio Stradivari F. in Cremona» («Майстэрня сям'і Антоніо С. з Крэмона»).
Н.В.Сазановіч.

СТРАЖ КРЭСО́ВА, Таварыства стражы крэсовай (Straż Kresowa, Towarzystwo Straży Kresowej), грамадска-паліт. арг-цыя ў 1920-я г., створаная з мэтай абароны польскіх інтарэсаў на *«крэсах усходніх»* (усх. украінах). Узнікла ў лют. 1918 у сувязі з перадачай герм. ваен. адміністрацыяй тэр. Холмшчыны Украіне. Ставіла за мэту адраджэнне польскага паліт., гасп. і культ. жыцця на тэр. «крэсаў» праз стварэнне на месцах польскіх грамадска-гасп. арг-цый: кааператываў, с.-г. і культ.-асв. гурткоў, маладзёжных аб'яднанняў і інш. Кіруючымі органамі С.к. з'яўляліся выканаўчы к-т і кіруючая рада. Атрымлівала крэдыты ад урада. З крас. 1919 дзейнічала на Беларусі, дзе былі створаны Беластоцкая, Брэсцкая, Віленская, Гродзенская і Мінская акр. У кастр. 1919 па ініцыятыве С.к. арганізаваны Часовы к-т адбудовы ўсх. зя-



Да арт. **Страдывары**. Адно з клеймаў А.Страдывары.

мель. У час польска-сав. вайны 1919—20 летам 1920 дапамагала арганізаваць полк імя караля Стафана Баторыя ў польскім войску. Удзельнічала ў правядзенні перапісу насельніцтва 1921 у Зах. Беларусі і ў падрыхтоўцы плебісцыту 1922 у *Сярэдняй Літве*. Фармальна выступала за аб'яднанне зямель б. ВКЛ з Польшчай на прынцыпах канфедэрацыі, фактычна была прыхільніцай інкарпарацыі бел., укр. і літ. зямель польскай дзяржавай. Падвяргалася вострай крытыцы з боку бел. нац. арг-цый як сродак урадавай палітыкі *паланізацыі*. Пасля ўсталявання ўстойлівай усх. мяжы Польшчы ў 1921—22 дзейнасць С.к. паступова заняпала. У 1927 канчаткова спыніла існаванне, хоць афіцыйна не была скасавана. *А.М.Чарнякевіч.*

СТРА́ЖАЎ Васіль Іванавіч (н. 26.7.1944, г. Каменск-Шахцінскі Растоўскай вобл., Расія), бел. фізік. Д-р фіз.-матэм. н. (1986), праф. (1987). Скончыў БДУ (1966). Акад. Бел. акадэміі адукацыі (1994, у 1994—99 прэзідэнт). З 1967 у АН Беларусі, з 1975 на парт. і выкладчыцкай рабоце, з 1988 у Мін-ве адукацыі Рэспублікі Беларусь (з 1991 нам. міністра, з 1994 міністр). З 2001 рэктар Рэсп. ін-та вышэйшай школы БДУ. Навук. працы па квантавай тэорыі поля. Даследаваў тэорыю электрамагнетызму ў прысутнасці магн. зараду, тэорыю поля з некампактнымі групамі ўнутр. сіметрыі. Сфармуляваў каліброўчную палявую тэорыю на аснове ўраўнення Дзірака—Кэлера. Устанавіў і даследаваў каліброўчныя і палярызацыйныя сіметрыі з улікам спінавых ступеней свабоды.

Тв.: Электродинамика с магнитным зарядом. Мн., 1975 (разам з Л.М.Тамільчыкам); От научной гипотезы к физическому факту. Мн., 1977 (разам з В.І.Куўшынавым); Поляризационная симметрия. Мн., 1996.

СТРА́ЖАЎ Віктар Іванавіч (н. 25.8.1932, с. Ківай Клінцоўскага р-на Бранскай вобл., Расія), бел. вучоны-эканаміст. Д-р эканам. н. (1978), праф. (1979). Скончыў Ленінградскі фін.-эканам. ін-т (1955). З 1955 працаваў у Мінскім фінансавым тэхнікуме, з 1960 у Ін-це эканомікі АН Беларусі, з 1965 у Бел. эканам. ун-це (у 1974—99 заг. кафедры). Навук. працы па праблемах сістэмнакомплекснага развіцця тэорыі, метадалогіі і методыкі функцыянальнага механізма сістэмы кіравання гасп. дзейнасцю, уліку і аналізу ў сістэме апаратыўнага кіравання, падрыхтоўкі, перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі эканамістаў і гуманізацыі адукацыі.

Тв.: Основы оперативного экономического анализа работы промышленных предприятий. Мн., 1970; Оперативное управление предприятием, проблемы учета и анализа. Мн., 1973; Управление хозрасчетной деятельностью — главное звено хозяйственного механизма. Мн., 1986 (разам з А.С.Сантаровічам, А.М.Канавалавым); Анализ хозяйственной деятельности в промышленности. 4 изд. Мн., 1999 (у сааўт.).

СТРА́ЖНІК, шляхецкі ўрад (пасада) у ВКЛ. Узнік у 16 ст. як С. польны. Яго абавязкам было назіранне за бяспекаю межаў, з Маскоўскай дзяржавай. Прызначаўся гетманам, з часоў Аўгуста III [1733—63] зацвярджаўся каралём. У 1635 заснаваны ўрад С. в я л і к а г а, абавязкам якога было ў час знаходжання караля ў войску кіраваць пярэдняй стражай і загадваць каравулам у час пастояў. Падобныя функцыі ў дачыненні да павятовага паспалітага рушэння мелі С. п а в я т о в ы я.

У.М.Вяроўкін-Шэлюта.

СТРАЖЭ́ВІЦКІЯ МАНЕ́ТНА-РЭ́ЧАВЫЯ СКА́РБЫ. Знойдзены ў 1898 і 1903 каля в. Стражэвічы Чашніцкага р-на Віцебскай вобл. С к а р б 1898 складаўся з 207 цэлых і абломкаў манет (48 куфіцкіх манет і 159 зах.-еўрап. дэнарыяў), 5 сярэбраных манетападобных пласцінак, 14 зліткаў і 50 інш. рэчаў. Агульная маса скарбу каля 781, у т.л. рэчавай часткі 527 г. Ухаваны каля 1040. Частка скарбу захоўвалася ў Музеі Магілёўскага губ. стат. к-та. С к а р б 1903 складаўся з 319 манет (46 куфіцкіх і 273 зах.-еўрап.), 2 цэлых і 4 кавалкаў зліткаў серабра, 1 залатога палачкападобнага злітка з абсечаным канцом і адтулінай, 6 сярэбраных і 2 залатых рэчаў. Агульная маса рэчавай часткі 461 г. Ухаваны каля 1015. Частка скарбу перададзена ў Эрмітаж (С.-Пецярбург), астатнія рэчы і манеты — у Музей Магілёўскага губ. стат. к-та і Музей Варшаўскага ун-та, дзе яны зніклі ў час 2-й сусв. вайны.

СТРАЖЭ́СКА Мікалай Дзмітрыевіч (29.12.1876, г. Адэса, Украіна — 27.6.1952), украінскі і расійскі вучоны ў



М.Д.**Стражэска**.

галіне клінічнай медыцыны. Акад. АН Украіны (1934). Акад. АН СССР (1943). Акад. АМН СССР (1944). Засл. дз. нав. Украіны (1934). Герой Сац. Працы (1947). Скончыў Кіеўскі ун-т (1899). Працаваў у лабараторыі І.П.*Паўлава*. З 1907 у Кіеўскім жаночым мед. ін-це, адначасова ў 1908—17 у Кіеўскім ун-це, з 1919 у Адэскім ун-це (заг. кафедры), з 1922 у Кіеўскім мед. ін-це, з 1936 дырэктар Укр. НДІ клінічнай медыцыны (з 1952 імя С.). Навук. працы па пытаннях кровазвароту, рэўматызму, сепсісу, хваробах страўнікава-кішачнага тракту і інш. Зрабіў класічнае апісанне клінікі інфаркту міякарда (1909; разам з В.П.Абразцовым). Распрацаваў прынцыпы фіз. дыягностыкі хвароб брушной поласці.

Тв.: Избр. труды. Т. 1—2. Киев, 1955—56.

Літ.: В а с и л е н к о В.Х. Н.Д.Стражеско: (к 100-летию со дня рождения) // Клинич. медицина. 1976. Т. 54, №12.

СТРАЙНО́ЎСКІ (Strojnowski) Іеранім (20.9.1754, с. Ходачкава Крамянецкага р-на Цярнопальскай вобл., Украіна — 5.8.1815), асветнік, правазнавец, рэліг. дзеяч. Адукацыю атрымаў у навуч. установах ордэна *піяраў*, членам якога быў у 1776—88. З 1776 выкладаў у Варшаўскім калегіуме. З 1780 праф. кафедры натуральнага права Гал. школы ВКЛ у Вільні, у 1799—1806 яе рэктар (у 1803



І.**Страйноўскі**.

пры яго ўдзеле пераўтворана ва ун-т). З 1789 удзельнічаў у рабоце Адукацыйнай камісіі і камісіі па падрыхтоўцы праектаў цывільнага і крымін. кодэксаў. Член *Вольнага эканамічнага таварыства* ў Пецярбургу і Варшаўскага т-ва сяброў навукі. З 1806 на царк. пасадах, з 1814 біскуп віленскі. Асн. яго твор «Навука права натуральнага, палітычннага, палітычнай эканоміі і права народаў» (Вільня, 1785), які вытрымаў 5 выданняў, у т.л. на рус. мове (1809), выкарыстоўваўся як падручнік для вышэйшых і сярэдніх спец. навуч. устаноў Польшчы, Беларусі, Літвы і Украіны. С. стаяў на пазіцыях *дэізму* і прызнаваў існаванне Бога ў якасці безаблічнай першапрычыны свету, які затым развіваецца на ўласных законах. У гнасеалогіі прытрымліваўся прынцыпаў сенсуалізму, гал. крыніцай пазнання лічыў адчуванне. Асновай яго сацыялагічнай канцэпцыі было вучэнне пра натуральны парадак рэчаў і як вынік яго — *натуральнае права*. Людзі, на яго думку, могуць быць шчаслівыя толькі праз глыбокае пазнанне і поўнае захаванне гэтага права; адыход чалавека або грамадства ад дакладных і разумных законаў прыроды непазбежна выклікае «пакаранне» — няшчасці, бедствы, беспарадкі. З натуральных правоў і прыроднай роўнасці людзей С. выводзіў сац. правы і абавяз-

кі, да якіх адносіў вечныя і нязменныя правы асабістай свабоды, узаемнай дапамогі, недатыкальнасці ўласнасці, недапушчальнасць ужывання сілы ў адносінах да інш. людзей, за выключэннем выпадкаў самаабароны. Ажыццяўленне на практыцы прынцыпаў натуральнага права С. разглядаў у якасці крытэрыяў «ісціннасці» або «няправільнасці» пэўнага сац.-паліт. ладу.

Літ.: Идеи гуманизма в общественно-политической и философской мысли Белоруссии (дооктябрьский период). Мн., 1977; Бирало А.А. Философские проблемы в науке эпохи Просвещения в Белоруссии и Литве. Мн., 1979; Асветнікі зямлі Беларускай, X — пачатак XX ст.: Энцыкл. давед. Мн., 2001.

С.Ф.Дубянецкі.

СТРАКА́ЛАЎ Генадзь Міхайлавіч (н. 28.10.1940, г. Мыцішчы Маскоўскай вобл., Расія), расійскі касманаўт. Двойчы Герой Сав. Саюза (1980, 1984). Лётчык-касманаўт СССР (1980). Канд. тэхн. н. (1985). Скончыў Маскоўскае вышэйшае тэхн. вучылішча імя Баўмана (1965). З 1973 у Цэнтры падрыхтоўкі касманаўтаў імя Гагарына. 27.11—10.12.1980 з Л.Дз.*Кізімам* і А.Р.*Макаравым* здзейсніў палёт на касм. караблі (КК) «Саюз Т-3» і арбітальнай станцыі (АС) «Салют-6»; 20—22.4.1983 з У.Г.*Цітовым* і А.А.*Серабровым* — на КК «Саюз Т-8»; 3—11.4.1984 з Ю.В.*Малышавым* і Р.*Шарма* — на КК «Саюз Т-11» і АС «Салют-7»; 1.8—10.12.1990 з Г.М.Манаковым — на КК «Саюз ТМ-10» і АС «Мір»; 14.3—7.7.1995 з У.М.Дзяжуравым і Н.*Тагардам* — на КК «Саюз ТМ-21» і АС «Мір» (пасадка на КК «Атлантыс», ЗША). Правёў у космасе 268,9 сут, у т.л. ў адкрытым космасе 21,5 гадз (6 выхадаў). З 1995 камандзір атрада касманаўтаў Ракетна-касм. карпарацыі «Энергія».

У.С.Ларыёнаў.

СТРАКАПЫ́ТАЎСКАЕ ПАЎСТА́ННЕ 1919, антыбальшавіцкае выступленне ў Гомелі 24—29.3.1919. Узнята 67-м і 68-м палкамі т.зв. Тульскай брыгады, перакінутымі ў сярэдзіне студз. ў Гомель з Бабруйска. Прычынамі выступлення сталі антысав. настроі вайскоўцаў, дрэнныя ўмовы іх забеспячэння, непадрыхтаванасць да ваен. дзеянняў, кантакты з мясц. насельніцтвам, незадаволеным «харчовай дыктатурай» і мабілізацыямі ў Чырв. Армію. Мяцеж пачаўся ў ноч на 23 сак. на станцыі Славечна. Абодва палкі пакінулі баявыя пазіцыі і праз Калінкавічы і Рэчыцу вярнуліся ў Гомель, патрабуючы адпраўкі ў Бранск. Створаны для барацьбы з мяцежнікамі ваен.-рэв. к-т абапіраўся на інтэрнац. роту і атрад асобага назначэння. 24 сак. Гомель апынуўся ў руках паўстанцаў. Гомельскі пав. к-т РКП(б) заняў абарону ў атэлі «Савой». Кіраўніцтва мяцяжом узяў на сябе «Палескі паўстанцкі камітэт» у складзе б. афіцэраў 67-га і 68-га палкоў на чале з заг. гасп. часткі М.Стракапытавым. У прынятых к-там адозвах абвяшчалася звяржэнне ўрада Леніна—Троцкага і стварэнне «Рускай Народнай Рэспублікі» з часовай перадачай уладных паўнамоцтваў «Палескаму паўстанцкаму камітэту». Праграма паўстання патрабавала перадачы ўсёй улады Устаноўчаму сходу, зямлі і грамадз. свабод — народу, спалучэння прыватнай і дзярж. ініцыятывы ў сферы вытв-сці. Гомельскія вайск. часці абвяшчаліся 1-й Арміяй «Рускай Народнай Рэспублікі». 25 сак. Ваен.-рэв. к-т здаўся паўстанцам. 28 сак. аб'яднанымі чырвонаармейскімі і мабілізаванымі камуніст. атрадамі з гарадоў Беларусі і РСФСР пачалося задушэнне мяцяжу. Стыхійная эвакуацыя паўстанцаў спалучылася з рабаваннямі, пажарамі і яўр. пагромам, а таксама расстрэлам членаў Ваен.-рэв. к-та. Паўстанцы, якія з баямі адступалі праз Рэчыцу і Васілевічы, у раёне Хойнікаў перайшлі фронт і здаліся атрадам С.Пятлюры. Яны былі перададзены польск. боку, раззброены і інтэрніраваны. Усяго ў час мяцяжу ў Гомелі загінула каля 100 чал., у выніку следства па прыгаворы ЧК за прыналежнасць да яго расстраляна больш за 150 чал.

Літ.: Лелевич Г. Стрекопытовщина: Страничка из истории контррев. выступлений в годы гражданской войны. 2 изд. М.; Пг., 1923; Лебедзева В. Стракапытаўскі мяцеж // Бел. мінуўшчына. 1995. № 4.

В.М.Лебедзева.

СТРАКА́ТКІ (Zygaenidae, або Anthroceridae), сямейства насякомых атр. матылёў. Каля 1200 відаў. Пашыраны паўсюдна, пераважна ў тропіках. На Беларусі 13 відаў, найб. трапляецца С. вятроўнікавая (Zygaena filipendulae).

Размах крылаў да 5 см; пярэднія падоўжаныя, вузкія, заднія адносна маленькія. Афарбоўка яркая, стракатая або аднатонная, з бліскам, часам бурая. Лічынкі кароткія, тоўстыя, расліннаедныя, большасць відаў — алігафагі, кормяцца лісцем пэўных раслін (пераважна бабовых). Гемалімфа мае сінільную к-ту (магчыма, і інш. атрутныя рэчывы), з чым звязана перасцерагальная афарбоўка.

С.Л.Максімава.

СТРАКА́ТЫ ВЕРШ, верш, напісаны на дзвюх ці больш мовах. У адрозненне ад *макаранічнага верша*, у якім словы з розных моў знаходзяцца побач у адным вершаваным радку, для С.в. характэрна пэўная сістэмнасць ва ўжыванні іншамоўнай лексікі. Вытокі бел. С.в. ў сярэдневяковых бел. інтэрмедыях, дзе паны, багі і чэрці звычайна гаварылі папольску, а сяляне — па-беларуску. У асобных двухмоўных творах В.Дуніна-Марцінкевіча (напр., у «Ідыліі») таксама існавала моўнае размежаванне паміж прадстаўнікамі пануючых класаў і працоўных (мова першых польская, другіх — беларуская). У С.в. ўжыванне той ці інш. мовы строга вытрымана ў межах пэўных частак ці асобных строф твора. Напр., у вершы П.Бузука «Як хазяін, чи гість, я не знаю» першыя 8 і апошнія 12 радкоў напісаны па-ўкраінску, сярэднія 17 — па-беларуску.

В.П.Рагойша.

СТРАКАЧЫ́ (Cleridae), сямейства жукоў падатр. разнаедных. Каля 3,5 тыс. відаў. Пашыраны паўсюдна, найб. у тропіках. На Беларусі 8 відаў, часцей трапляюцца С. мурашыны, або мурашкажук (Thanasimus formicarius), і С. пчаліны, або пчалажук звычайны (Trichodes apiarius).

Даўж. да 25 мм. Цела прадаўгаватае, укрытае валаскамі, цёмнае, часта з яркімі, стракатымі надкрыламі ў разнаколерных папярочных палосах (адсюль назва). Галава вял., вусікі 11-членікавыя. Лапкі 5-членікавыя. Дарослыя і лічынкі большасці С. — драпежнікі, кормяцца насякомымі і іх лічынкамі; ёсць некрафагі; некат. віды паразітуюць у гнёздах пчол, вос, пашкоджваюць харч. прадукты. Іл. гл. да арт. *Жукі*.

С.Л.Максімава.

СТРАКО́ЗЫ (Odonata, або Odonatoptera), атрад насякомых. 3 падатр.: раўнакрылыя (Zygoptera), разнакрылыя (Anisoptera) і анізазігаптэра (Anisozygoptera). Больш за 4,5 тыс. відаў. Вядомы з карбону (каля 350 млн. г. назад). Пашыраны паўсюдна, пераважна ў тропіках і вільготных субтропіках. Жывуць паблізу вадаёмаў. На Беларусі каля 50 відаў з падатр. раўнакрылых і разнакрылых С. Найб. трапляюцца С. з сям. *прыгажунь*, бабак, або патрульшчыкаў (Corduliidae), дзедак (Gomphidae), каромыслаў (Aeschnidae), лютак (Lestidae), пласканожак (Platycnemidae), сапраўдных стракоз (Libellulidae), стрэлак (Coenagrionidae). У Чырв. кнізе 5 відаў: *булавабрух* кольчаты, *прыгажуня* бліскучая, *сціснутабрух* перавязаны, беланоска таўстахвостая (Leucorrhinia caudalis), дазоршчык-уладар (Anax imperator).

Крылаў 2 пары; празрыстыя, перапончатыя, густа жылкаваныя. Даўж. брушка да 120 мм, задняга крыла да 94 мм. Вочы вял., фасетач-



Стракаткі: 1 — канюшынная; 2 — шчаўевая; 3 — вятроўнікавая; 4 — эфіяльт.



Стракозы: 1 — лютка-дрыяда; 2 — беланоска таўстахвостая; 3 — дазоршчык-уладар; 4 — каромысла вялікае; 5 — бабка бронзавая; 6 — страказа звычайная.

ныя, простых вочак 3. Вусікі кароткія. Ротавыя органы грызучыя. У адрозненне ад інш. насякомых маюць дорсавентральныя мышцы крылаў і другасны капулятыўны апарат у самцоў. Дрэпежнікі. Развіццё з няпоўным ператварэннем. Лічынкі (наяды) драпежныя, жывуць у вадзе. Дыхаюць вонкавымі (хваставымі) або рэктальнымі (вырасты задняй кішкі) жабрамі. *С.Л.Максімава.*

СТРАЛА́, кідальны снарад для стральбы з *лука*, *арбалета*, самастрэла, духавога ружжа і некат. відаў *кідальных машын*. Найб. распаўсюджаная С. для лука складалася з дрэўка даўж. да 120 см (з прамаслойнага дрэва ці трыснягу), наканечніка (з крэменю, косці, бронзы, жалеза), апярэння (з пер'я птушак, ліся дрэў і інш.), вушка (прылада для ўпору на цеціву, з косці ці рогу).

На тэр. Беларусі лук і С. вядомы з неаліту, пашыраны ўсх.-еўрап. тронкавыя С. з утулкавымі наканечнікамі. У 4—3 ст. да н.э. на Пд Беларусі ў выніку кантактаў са скіфамі з'явіліся бронзавыя наканечнікі С. з трыма і дзвюма лопасцямі. Да сярэдзіны 1-га тыс. н.э. трохлопасцевыя жалезныя наканечнікі вядомы на З Беларусі і ў Літве. У 10—11 ст. з пашырэннем *кальчуг* і інш. метал. даспехаў яны выйшлі з ужытку. З жал. веку да канца 18 ст. (да выцяснення *агнястрэльнай зброі*) у ваен. практыцы і для палявання выкарыстоўвалі С. з пляскатым наканечнікам. Гранёныя наканечнікі С. вядомы з канца 1-га тыс. н.э.

У наш час С. выкарыстоўваюцца для спарт. *стральбы з лука*.

Г.М.Сагановіч, У.П.Ксяндзоў.

СТРАЛА́ (лац. Sagitta), сузор'е Паўн. паўшар'я неба. Найб. яркія зоркі 3,5 і 3,8 візуальнай *зорнай велічыні*; 20 зорак ярчэй 6-й зорнай велічыні. На Беларусі добра відаць летам. Гл. *Зорнае неба*.

«СТРАЛА́», «Ваджэнне і пахаванне стралы» («сулы»), даўні ахоўна-засцерагальны і магічна-агр. абрад усх. славян, якім завяршаўся веснавы каляндарна-земляробчы цыкл. Праводзіўся ў канцы вясны пры аглядах азімых (на Вялікдзень, Юр'я, Ушэсце). Рэгіён найб. пашырэння — Пасожжа, тэр. паміж Дняпром і Прыпяццю, часткова Гомельская, Чарнігаўская (Украіна) і Бранская (Расія) вобл. (супадае з вобласцю рассялення радзімічаў, часткова дрыгавічоў і вяцічаў). Асн. рытуальныя дзеянні: ваджэнне карагодаў, шэсці радамі («танок»), гульні, качанне па полі, закопванне «С.» і інш. Шанаванне «громных стрэлак» (каменныя сякеры, молаты, коп'і, белямніты) — стараж. абрад. Паводле летапісаў 13—15 ст. і інш. пісьмовых і археал. матэрыялаў, лічылася, што яны скінуты з неба. Паводле сведчання бел. археолагаў, «громныя стрэлкі» пачалі зберагацца з неалітычных часоў.

Прымхлівае шанаванне камянёў было не толькі ва ўсх.-слав. народаў, а і ў некат. народаў Еўропы і Азіі. У Японіі «громныя стрэлкі» (рай-фунасекі) прыпісваюцца нябеснаму вартавому — богу Тэнгу. У кіт. і інд. фальклоры ўпамінаюцца вераванні ў боскае паходжанне каменных прылад. «Стрэлкі» абагаўляліся, іх насілі на целе («наузы»), ім надавалася ахоўная, магічна-лекавая і апладняльная функцыі.

На Беларусі забіты Перуном лічыўся «святым», а той, хто знаходзіў «стрэлку», лічыўся шчаслівым чалавекам. Паводле вераванняў, пажар, выкліканы маланкай, трэба тушыць малаком. Песні, якія выконваліся ў час абраду «С.», бытуюць і цяпер у пазаабрадавай паэзіі на ўсёй Беларусі. Найб. архаічныя варыянты з абрадам захаваліся ў Веткаўскім, Чачэрскім і сумежных раёнах, якія лічацца ядром распаўсюджання «С.». Паступова песні страцілі прымеркаванасць да абрадавай паэзіі. Абрад пахавання «сулы» (таксама зброя Перуна; суліца — кап'ё, рагаціна) — неаддзельны ад «С.». Падобныя да «С.» абрады пахавання Ярылы, Каструбанькі, Лялькі і інш. У сучасным бытаванні «С.» ўспрымаецца як вясёлая нар. гульня. Культ «С.» выяўляецца ў бел. тапанімічных назвах (Страліца, Стрэлка, Стрэльская Горка, Пастралкі, Стрэльск, Стралічава, Вялікія і Малыя Стралкі і інш.), у нар. мастацтве (у вышыўцы, разьбе па дрэве).

А.Ю.Лозка.

СТРАЛА́-ЗМЯЯ́ (Psammophis lineolatus), змяя роду пясчаных змей сям. вужовых. Пашырана ў Цэнтр. і Зах. Азіі. Жыве ў пустынях і паўпустынях, трапляецца ў гарах. У паўд. ч. арэала ўпадае ў летнюю спячку.







Да арт. **Страла**: 1 — крамянёвы наканечнік стралы з гарадзішча Мыслі Капыльскага раёна (1—4 ст.); 2 — жалезныя наканечнікі стрэл з селішча Струга Столінскага раёна (7—9 ст.); 3 — страла з Паўночнай Індыі з чатырохлопасцевым апярэннем і доўгім шасцігранным наканечнікам для прабівання кальчугі; 4 — японская страла з вілападобным стальным наканечнікам; 5 — рытуальная страла індзейцаў племя сіу.



Страла-змяя.

Даўж. да 90 см. Цела тонкае, на спіне 4 падоўжныя цёмныя палосы на аліўкава-шэрым фоне, аблямаваныя чорным. Луска гладкая. Ядаправодныя зубы на задняй ч. верхнясківічнай косці. Перамяшчаецца імкліва (адсюль назва). Корміцца пераважна яшчаркамі, буйнымі насякомымі. *Э.Р.Самусенка.*

СТРАЛЕ́Ц (лац. Sagittarius), адно з 12 сузор'яў *задыяка*. Знаходзіцца ў Паўд. паўшар'і неба. Найб. яркія зоркі 1,8 і 2,0 візуальнай *зорнай велічыні*; 115 зорак ярчэй 6-й зорнай велічыні. У С. знаходзіцца пункт зімовага *сонцастаяння* і цэнтр *Галактыкі*; размешчана многа *зорных скопішчаў* і туманнасцей, бачна простым вокам шаравое зорнае скопішча M55. На Беларусі відаць вясной і летам. Гл. *Зорнае неба.*



Сузор'е **Стралец**.

СТРАЛЕ́ЦКАЕ ПАЎСТА́ННЕ 1698 у Расіі, паўстанне маскоўскіх *стральцоў*, выкліканае іх нежаданнем несці цяжкую службу ў памежных крэпасцях і ўціскам з боку палкоўнікаў. 4 палкі маскоўскіх стральцоў (каля 4 тыс. чал.), якія ў 1695—96 удзельнічалі ў паходах на *Азоў*, замест вяртання ў Маскву былі накіраваны ўрадам (цар Пётр I падарожнічаў за мяжой) ахоўваць граніцу з ВКЛ. На шляху ў г. Вял. Лукі стральцы паўсталі, змясцілі начальнікаў і пайшлі на Маскву. Яны наладзілі сувязь з царэўнай *Соф'яй Аляксееўнай*, зняволенай у Новадзявочым манастыры, і збіраліся ўзвесці на прастол яе або кн. В.В.Галіцына, але 28.6.1698 разбіты ўрадавымі войскамі каля *Новаіерусалімскага манастыра*. У 1698—99 пакараны смерцю 1239 стральцоў, 601 пасля пакарання бізуном і клеймавання сасланы. Былі расфарміраваны і тыя стралецкія палкі маскоўскага гарнізона, якія не ўдзельнічалі ў паўстанні, а стральцы з сем'ямі высланы з Масквы. Т.ч. са сталіцы была выдалена варожая Пятру I ваен.-паліт. сіла.

Літ.: Буганов В.И. Московские восстания конца XVII в. М., 1969.

СТРАЛЕ́ЦКІ СТЭП, участак абложнага разнатраўна-злакавага стэпу; за 20 км на Пд ад г. Курск у Расіі. Разам з суседнімі астраўнымі дубровамі ўяўляе сабой тыповы *лесастэп*. Уваходзіць у *Цэнтральначарназёмны запаведнік*.

СТРАЛІ́ЧАВА, вёска ў Хойніцкім р-не Гомельскай вобл., на аўтадарозе Хойнікі—Оўруч (Украіна). Цэнтр сельсавета і эксперым. базы «Стралічава». За 7 км на Пд ад горада і 12 км ад чыг. ст. Хойнікі, 110 км ад Гомеля. 979 ж., 349 двароў (2001). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Малітоўны дом евангельскіх хрысціян-баптыстаў. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

СТРАЛКО́ВАЯ ЗБРО́Я, ствольная *зброя* для стральбы *кулямі* або інш. паражальнымі элементамі; найб. масавы від зброі. Адрозніваюць С.з. малога (да 6,5 мм), нармальнага (6,5—9 мм) і буйнога (зв. 9—14 мм) калібру; паводле прызначэння — баявую, прыстрэлачную, вучэбную, *спартыўную зброю, паляўнічую зброю*. Да С.з. належаць *аўтаматы, вінтоўкі, карабіны, кулямёты, пісталеты, пісталеты-кулямёты, рэвальверы*. У залежнасці ад крыніцы энергіі кідання існуе *агнястрэльная зброя, пнеўматычная зброя*, механічная і электрычная; паводле ступені аўтаматызацыі — неаўтаматычная, самазарадная і аўтаматычная; паводле колькасці ствалоў — аднаствольная, двухствольная і мнагаствольная; паводле канструкцыі ствала — *наразная зброя* і гладкаствольная.

Узоры С.з. з'явіліся ў 14 ст. Асн. этапы развіцця: распрацоўка і выкарыстанне кнотавага (15 ст.) і крамянёвага (канец 15 ст.) *замка*, папяровага патрона (сярэдзіна 16 ст.), ударнага саставу і капсульнага замка (пач. 19 ст.), наразной зброі (сярэдзіна 19 ст.), унітарнага патрона з метал. гільзай і казназарадной зброі (2-я пал. 19 ст.), магазіннай зброі (канец 19 ст.; гл. *Магазін*). Далейшае ўдасканаленне С.з. ішло па лініі стварэння *аўтаматычнай зброі* (канец 19 — пач. 20 ст.), якая шырока выкарыстоўвалася ў 1-ю і 2-ю сусв. войны. Асн. асаблівасці С.з.: высокая эфектыўнасць, трываласць дзеяння, манеўранасць, зручнасць і прастата эксплуатацыі; мае высокую скарастрэльнасць, добрую меткасць і кучнасць стральбы. Сярод рас. канструктараў С.з. У.Р.*Фёдараў*, В.А.*Дзегцяроў*, С.Г.*Сіманаў*, Ф.В.*Токараў*, Г.С.*Шпагін*, М.Ф.*Макараў*, Б.Г.*Шпітальны*, М.Ц.*Калашнікаў*, Г.М.*Ніканаў* і інш. Іл. гл. да арт. *Зброя*.
С.М.Абрамаў, В.А.Юшкевіч.

СТРАЛКО́ВЫ СПОРТ, спартыўная стральба з ручной наразной агнястрэльнай і пнеўматычнай зброі — *стральба кулявая* і з гладкаствольнай — *стральба стэндавая*, а таксама *стральба з лука*. Страляюць у *цірах*, на *стрэльбішчах* і стралковых стадыёнах з дыстанцый 10, 25, 50, 100 і 300 м па мішэнях нерухомых, рухомых і якія паяўляюцца і знікаюць (напр., «бягучы алень», «бягучы дзік»). Састаўная частка розных мнагабор'яў і ваенізаваных спаборніцтваў.

Адзін з найб. стараж. відаў спарт. практыкаванняў. Папярэднічалі С.с. спаборніцтвы па трапнай стральбе з лука і арбалета. Спарт. стралковыя аб'яднанні, клубы, ціры пачалі з'яўляцца ў 19 ст. У праграму Алімп. гульняў стральба кулявая ўваходзіць з 1896, стральба стэндавая — з 1900. Першы чэмпіянат Расіі праведзены ў 1898 (г. Хабараўск). Міжнар. саюз С.с. засн. ў 1907. Найб. пашыраны С.с. ў Вялікабрытаніі, Германіі, ЗША, Італіі, Нарвегіі, Расіі, Швецыі і інш.

На Беларусі С.с. развіваецца з пач. 1920-х г. (у гарадах Віцебск, Гомель, Мінск, Магілёў). Спаборніцтвы праводзяцца з 1923—24. Пад Мінскам у 1972 пабудаваны (рэканструяваны ў 1985) *спартыўна-стралковы* комплекс імя маршала С.К.Цімашэнкі.

СТРАЛКО́ВЫЯ ВО́ЙСКІ, назва лёгкай пяхоты ў шэрагу армій еўрап. краін з 18 ст.; па традыцыі назва захоўвалася для некат. пяхотных часцей і злучэнняў і ў 2-й пал. 19 — 1-й пал. 20 ст. С.в. мелі на ўзбраенні штуцэры, вінтоўкі, а таксама аблегчаны рыштунак. Аналагічныя па прызначэнні войскі рас. арміі спачатку называліся егерскімі; у 1833—56 існавалі Віцебскі 13-ы егерскі полк, Полацкі 14-ы егерскі полк і інш. Першыя асобныя стралк. батальёны сфарміраваны ў 1830-я г., потым — стралк. палкі, брыгады і дывізіі. У СССР у складзе *сухапутных войск* С.в. існавалі з 1918 да пач. 1960-х г. У сувязі з аснашчэннем С.в. сучаснай тэхнікай у 2-й пал. 1950-х г. створаны мотастралк. злучэнні, з 1963 — *мотастралковыя войскі*. *С.В.Папоў.*

СТРАЛКО́Ў Віталь Георгіевіч (11.1.1930, в. Катэгурт Дэбескага р-на, Удмурція — 26.3.2000), бел. вучоны ў галіне сельскай гаспадаркі. Д-р с.-г. н., праф. (1977). Скончыў Усесаюзны с.-г. ін-т (1954). З 1963 у Бел. с.-г. акадэміі. Навук. працы па пытаннях рэкультывацыі выпрацаваных тарфянікаў, асаблівасцей і прыёмаў вырошчвання перспектыўных шматгадовых бабовых траў (рутвіцы рагатай). Кіраўнік распрацоўкі рэсурсазберагальнай тэхналогіі высокапрадукцыйных травастояў.

Тв.: Параўнальная ураджайнасць бабова-злакавых травасумесей ва ўмовах сухадольнай пашы // Весці. АН БССР. Сер. с.-г. навук. 1972. № 4; Энергосберегающая технология создания сенокосов и пастбищ (разам з К.К.Курыловічам, Ю.В.Алёхінай) // Междунар. аграр. журн. 2000. № 9.

СТРАЛКО́Ў Ігнат Георгіевіч (13.2.1898, в. Глазамічы Віцебскага р-на — 16.2.1969), бел. вучоны ў галіне раслінаводства. Д-р с.-г. н. (1963), праф. (1964). Скончыў Горы-Горацкі земляробчы ін-т (1924). У 1924—30 у Наркамземе Беларусі. З 1945 у Ін-це сацыяліст. сельскай гаспадаркі АН Беларусі. З 1948 заг. аддзела зернебабовых культур БелНДІ земляробства. Навук. працы па пытаннях апрацоўкі глебы, агратэхнікі, фізіялогіі і біяхіміі раслін, селекцыі і насенняводства зернебабовых культур.

Тв.: Многолетний люпин. Мн., 1962 (разам з М.Дз.Нагорскай, І.П.Астравым); Окультуривание легких почв Белоруссии. Мн., 1967.

СТРАЛКО́ЎСКАЕ ВО́ЗЕРА. У Верхнядзвінскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Ужыца, за 25 км на ПнУ ад г. Верхнядзвінск. Пл. 0,93 км^2, даўж. 1,6 км, найб. шыр. 850 м, даўж. берагавой лініі

3,6 км, пл. вадазбору 10,9 км^2. Схілы і берагі катлавіны нізкія, забалочаныя, часткова пад ворывам. Дно выслана сапрапелем. Выцякае ручай у р. Ужыца.

СТРАЛЬБА́ З ЛУ́КА, спаборніцтвы па стральбе стрэламі па мішэнях; адзін з найб. стараж. відаў спорту. Мэта — трапіць у мішэнь найбліжэй да яе цэнтра. Страляюць са спарт. лука, які складаецца з дрэўка (драўлянае, метал., з сінт. матэрыялаў або камбінаванае) і цеціву (сінт. валокны). Маса лука ў мужчын 22 кг, у жанчын каля 15 кг. Страла — драўляны, метал. ці пластмасавы стрыжань з наканечнікам і апярэннем. Спаборніцтвы праводзяцца на дыстанцыях 30, 50, 70 і 90 м для мужчын і 30, 50, 60 і 70 м для жанчын. Дыяметр мішэні 80 і 122 см.

Спаборніцтвы па С. з л. вядомы з 15 ст. (Швейцарыя). Міжнар. федэрацыя заснавана ў 1931. Чэмпіянаты свету праводзяцца з 1931 (штогод, з 1960 праз год), Еўропы — з 1968, у асабістым і камандным заліках. У праграме Алімп. гульняў — з 1904. Найб. пашырана ў Вялікабрытаніі, Бельгіі, ЗША, Канадзе, Карэі, краінах Скандынавіі.

На Беларусі развіваецца з 1960; 1-ы чэмпіянат рэспублікі праведзены ў 1961. Сярод бел. спартсменаў найб. вызначыліся Б.Ісачанка, В.Мароз, Г.Карасёва, А.Марфель і інш.

СТРАЛЬБА́ КУЛЯВА́Я, спартыўная стральба з агнястрэльнай ці пнеўматычнай наразной зброі (вінтоўкі, пісталеты). Уключае стральбу звычайную па мішэнях, скорасную па фігурных (сілуэтных) мішэнях, па перасоўных мішэнях «бягучы дзік» і «бягучы алень». Спаборніцтвы праводзяцца на дыстанцыях 10, 25, 50, 100 і 300 м.

Першыя спаборніцтвы ў стральбе з вінтовак адбыліся ў Швейцарыі (1824). У праграме Алімп. гульняў з 1896. Чэмпіянаты свету праводзяцца з 1897 (з 1954 — раз у 4 гады). Стральба ўключана ў *біятлон* (малакаліберная вінтоўка), марское мнагабор'е; стральба з пісталетаў — у *пяцібор'е* і ваен.-прыкладныя мнагабор'і.

Чэмпіянаты Беларусі праводзяцца з 1924. У камандным заліку бел. стралкі — сярэбраныя прызёры чэмпіянату СССР (1976), 3-е (2000) і 5-е (2001) месцы на чэмпіянатах Еўропы. Сярод спартсменаў найб. вызначыліся І.*Бакалаў*, І.*Басінскі*, Л.*Бейдзіна*, А.*Газаў*, А.*Іваноў*, А.*Кедзяраў*, К.*Лукашык*, В.*Пархімовіч*, І.*Шылава*, Л.*Яўглеўская* і інш.

СТРАЛЬБА́ СТЭ́НДАВАЯ, стральба з гладкаствольнай зброі шротам па лятаючых мішэнях (талерачках) на спец. пляцоўках — траншэйным і круглым стэндах; від *стралковага спорту*. Да 1940 наз. «стралкова-паляўнічы спорт».

Паходзіць ад трэніровачнай стральбы ў сярэдневяковай Англіі. Як від спорту існуе з канца 19 ст. У праграме Алімп. гульняў: на траншэйным стэндзе з 1900; паводле сучасных правіл (200 мішэней) — з 1952; на круглым стэндзе — з 1968. Асабіста-камандныя чэмпіянаты свету праводзяцца з 1935 на траншэйным і з 1947 на круглым стэндах; для жанчын на абодвух стэндах з 1962. Чэмпіянаты Еўропы праводзяцца для мужчын з 1955, для жанчын з 1964. Найб. пашырана ў Вялікабрытаніі, Германіі, ЗША, Італіі, Іспаніі, Польшчы, Расіі, Францыі і інш.

На Беларусі развіваецца з пач. 1920-х г. Першы чэмпіянат рэспублікі праведзены ў 1927. Зборная каманда Беларусі на VI летняй Спартакіядзе народаў СССР (1975) заняла 4-е месца. Сярод бел. стралкоў найб. вызначыліся Г.*Галкін*, чэмпіёны СССР: В.Вятохін (1967), Ш.Ляцьен (1971).

СТРАЛЬЦО́Ў Барыс Васілевіч (н. 1.3.1926, в. Хутар Быхаўскага р-на Магілёўскай вобл.), бел. публіцыст, пісьменнік. Канд. гіст. н. (1968), д-р філал. н. (1978), праф. (1979). Скончыў БДУ (1956). Працаваў у газ. «Чырвоная змена» і «Звязда» (1953—69). З 1969 заг. кафедры тэорыі і практыкі сав. журналістыкі, з 1999 праф. кафедры сацыялогіі журналістыкі БДУ, адначасова нам. рэдактара час. «Веснік БДУ» (1969—98). Даследуе жанры сучаснай публіцыстыкі. Аўтар манаграфій «Публіцыстычнасць інфармацыйных жанраў» (1973), «Аналітычныя жанры» (1974), «Публіцыстыка: Жанры. Майстэрства» (1977), «Дзесятая пяцігодка ў беларускім нарысе» (1980), «Асновы літаратурна-мастацкай творчасці» (ч. 1—2, 1999), «Асноўныя творчыя метады ў журналістыцы» (2000) і інш. Асн. тэматыка маст. твораў — жыццё вёскі, клопаты моладзі і інтэлігенцыі (зб-кі апавяданняў «Наследнік», 1963, «Сыходзяцца бальшакі і прасёлкі», 1969; аповесці «Вячэрняя планета», 1975, «Метраном памяці», 1985; раман «Між крутых берагоў», 1980; зб. абразкоў і апавяданняў «Чарадзейны туман», 2000).

Тв.: Маральны клімат вытворчага калектыву і друк. Мн., 1979; Фельетон: Теория и практика жанра. Мн., 1983; Основы публицистики: Жанры. Мн., 1990.

СТРАЛЬЦО́Ў Міхась (Міхаіл Лявонавіч; 14.2.1937, в. Сычын Слаўгарадскага р-на Магілёўскай вобл. — 23.8.1987), бел. пісьменнік. Скончыў БДУ (1959). Працаваў у газ. «Літаратура і мастацтва», час. «Полымя», «Маладосць», «Нёман». Друкаваўся з 1952. У першым зб. апавяданняў «Блакітны вецер» (1962) праявіў сябе тонкім псіхолагам, знаўцам побыту вёскі і горада. У зб. «Сена на асфальце» (1966) раскрыў псіхал. і эстэт. ўжыванне нядаўняга вяскоўца ў гар. стыхію, магчымасці гарманічнага спалучэння ў чалавеку эмац. і інтэлектуальнага пачаткаў. У аповесці «Адзін лапаць, адзін чунь» (1970) — фарміраванне характару падлетка ў цяжкія пасляваен. гады. Акварэльнасць, тонкі псіхалагізм і лірычны роздум у зб-ках вершаў «Ядлоўцавы куст» (1973), «Цень ад вясла» (1979), «Яшчэ і заўтра» (1983), «Мой свеце ясны» (1986, Дзярж. прэмія Беларусі 1988). У вершах-споведзях, філас. мініяцюрах, замалёўках і іранічных вершах-экспромтах выяўляецца душэўная чысціня і вернасць чалавечаму прызванню. У зб. «Жыццё ў слове» (1965) узнёсла і разважліва аналізаваў майстэрства Ф.Багушэвіча, Я.Купалы, Я.Коласа, М.Багдановіча, Ц.Гартнага, К.Чорнага, П.Пестрака, А.Русецкага, А.Зарыцкага. Аўтар кніг «У полі зроку» (1976), «Пячатка майстра» (1986) пра творчасць Я.Коласа, З.Бядулі, М.Гарэцкага, К.Чорнага, У.Дубоўкі, А.Куляшова, Я.Брыля, П.Панчанкі, А.Вялюгіна і інш., эсэ «Загадка Багдановіча» (1969). Перакладаў на бел. мову творы А.Пушкіна, Я.Смелякова, М.Браўна, Н.Гільена, П.Неруды, сучасных італьян. паэтаў, раманы Ч.Айтматава, прозу Б.Пастарнака, Л.Лявонава і інш.

Тв.: На ўспамін аб радасці. Мн., 1974; Падарожжа за горад. Мн., 1986; Выбранае. Мн., 1987.



Б.В.**Стральцоў**.



М.**Стральцоў**.

Літ.: Бугаёў Дз. Шматгранасць. Мн., 1970; Сямёнава А. Гарачы след таленту. Мн., 1979; Оскоцкий В. И трава, и асфальт: Заметки о прозе М.Стрельцова // Неман. 1979. № 6; Адамович А. Испытание словом // Там жа. 1987. № 2; Карамазаў В. І прадчуванне, і лёс // Полымя, 1987. № 2.

Р.І.Барадулін.

СТРАЛЬЦО́Ў Уладзімір Антонавіч (н. 20.8.1947, пас. Новааляксандраўка Суражскага р-на Бранскай вобл., Расія), бел. вучоны ў галіне жывёлагадоўлі. Д-р с.-г. н. (1995). Скончыў Бел. с.-г. акадэмію (1974). З 1978 у Бел. НДІ жывёлагадоўлі. З 2000 у Бранскай с.-г. акадэміі. Навук. працы па праблемах новых тэхналогій племянной работы, удасканалення механізацыі і аўтаматызацыі ўтрымання і развядзення с.-г. жывёл.

Тв.: Эффективность промышленных технологий производства свинины в Белорусской ССР (разам з Л.А.Кавалёнак) // Индустриализация производства мяса. М., 1987; Эффективность технологии племенной работы в товарных хозяйствах с использованием свинок собственной репродукции // Зоотехническая наука Беларуси: Сб. статей. Мн., 1996. Т. 32.

СТРАЛЬЦЫ́, вёска ў Глядавіцкім с/с Мастоўскага р-на Гродзенскай вобл. Цэнтр калгаса. За 30 км на ПнЗ ад г. Масты, 37 км ад Гродна, 20 км ад чыг. ст. Скідзель. 310 ж., 119 двароў (2001). Базавая школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

СТРАЛЬЦЫ́, 1) катэгорыя сялян-слуг у ВКЛ у 15—18 ст., асн. павіннасцю якіх у дзярж. уладаннях была арганізацыя і ўдзел у паляванні вял. князя (егерская служба), акрамя таго, С. лічыліся ваен-

наабавязанымі. З сярэдзіны 16 ст. С. плаціві *чынш* (у той год, калі не выконвалі сваіх прамых абавязкаў). Паводле ардынацыі пушчаў 1641 С. былі вызвалены ад абавязку ўдзелу ў ваен. паходах, а павіннасці з іх сталі спаганяцца як з адной *валокі* зямлі. З 2-й пал. 17 ст. С. зноў ваеннаабавязаныя. У 18 ст., як правіла, пры выкананні егерскай павіннасці абавязаны былі плаціць чынш, натуральны падатак і інш. У прыватных і царк. уладаннях С. выконвалі ў асн. толькі егерскую службу. 2) Назва воінаў ВКЛ у 15—17 ст., якіх выстаўлялі мяшчане ўсх.-бел. гарадоў для абароны замкаў у час небяспекі. 3) Першае пастаяннае войска ў Рас. дзяржаве ў 16 — пач. 18 ст. (стралецкае войска), узброенае халоднай (бердышы) агнястрэльнай зброяй (*пішчалі*). Створана ў 1540—50-х г. Напачатку С. набіралі з пасадскага і сельскага насельніцтва, потым іх служба стала пажыццёвай і спадчыннай. С. атрымлівалі жалаванне грашамі, хлебам, зрэдку зямлёю. Падпарадкоўваліся Стралецкаму прыказу, а ў час вайны — военачальнікам. Жылі асобнымі слабодамі, мелі сем'і, займаліся рамёствамі і гандлем. У мірны час неслі гарнізонную і пагран. службу, у ваенны — прымалі ўдзел у паходах і бітвах. У 17 ст. С. ўдзельнічалі ў антыпрыгонніцкіх выступленнях, сял. войнах пач. 17 ст. і 1670—71 (пад кіраўніцтвам С.Разіна), антыўрадавых паўстаннях, у т.л. ў *Маскоўскім паўстанні 1682*, *Стралецкім паўстанні 1698*. У 1720-х г. стралецкае войска расфарміравана Пятром I. Да гэтага часу завершана стварэнне рас. *рэгулярнага войска*, заснаванага на *рэкруцкай павіннасці*.

Літ.: Чернов А.В. Вооруженные силы Русского государства в XV—XVII вв. М., 1954; Буганов В.И. Московские восстания конца XVII в. М., 1969.

СТРАЛЬЧО́НАК Алег Анатолевіч (н. 18.10.1947, г. Кобрын Брэсцкай вобл.), бел. вучоны ў галіне біярган. хіміі і біяхіміі гармонаў. Акад. Нац. АН Беларусі (1994, чл.-кар. 1989), д-р хім. н. (1983). Скончыў БДУ (1970). У 1973—2000 у Ін-це біярган. хіміі Нац. АН Беларусі (з 1979 заг. лабараторыі, з 1989 дырэктар). З 2000 у Швецыі. Навук. працы па хіміі гармонаў і гарманальнай рэцэпцыі, даследаванні структурнай арганізацыі і заканамернасцей функцыянавання мембранных сістэм распазнавання гармон-глікапратэінавых комплексаў, распрацоўцы навук. асноў і тэхналогіі вытв-сці імунадыягнастычных сродкаў мікрааналізу. Дзярж. прэмія Беларусі 1988.

Тв.: Роль стероидсвязывающих гликопротеинов крови человека в передаче гормонального сигнала к клетке // Физиол. журн. СССР. 1990. Т. 76, № 9; О ранее не известном свойстве нормального иммуноглобулина М человека — способности специфически связывать тиреоидные гормоны (у сааўт.) // Докл. АН Беларуси. 1992. Т. 36, № 3/4.

СТРАЛЮ́К Мар'ян Іванавіч (6.1.1938, в. Мохавічы Лідскага р-на Гродзенскай вобл. — 25.8.2000), бел. вучоны ў галіне энергетыкі. Чл.-кар. Нац. АН Беларусі (1989), д-р тэхн. н. (1986), праф. (1987). Засл. дз. нав. Беларусі (1999). Скончыў БПІ (1961). З 1961 працаваў на Наваполацкай ЦЭЦ-2, з 1963 у БПА (з 1978 нам. дэкана, дэкан, з 1987 прарэктар). Навук. працы па тэорыі і практыцы даследавання электрадынамічнай устойлівасці токаправодных канструкцый. Распрацаваў тэорыю і метады разліку электрадынамічных намаганняў у прасторавых токаправодных сістэмах адвольнай канфігурацыі.





Тв.: Расчет электродинамических усилий в системе произвольно расположенных прямолинейных проводников (у сааўт.) // Электричество. 1976. № 5; Расчет электродинамической стойкости гибких шин ОРУ с учетом климатических условий (у сааўт.) // Изв. вузов и энергообъединений СНГ. Энергетика. 1994. № 5/6.

СТРАМАТАПАРАІДЭ́І (Stromatoporoidea), група выкапнёвых каланіяльных беспазваночных. Умоўна адносяць да кішачнаполасцевых або гідроідных паліпаў. Некалькі сям., каля 70 родаў. Жылі з ранняга палеазою да канца мезазою ў мелкаводнай зоне мораў. Рыфаўтваральнікі. На Беларусі рэшткі выяўлены ў адкладах сілуру і дэвону.

Памеры ад некалькіх міліметраў да 2 і больш метраў у папярочніку. Шкілет вапняковы, рознай формы (коркападобнай, сферападобнай, конусападобнай і інш.), складаўся з гарыз. пласцін (ламін) і верт. элементаў (слупкоў), на паверхні — сістэма каналаў (астрарыз), якія складаліся з І верт. і адыходзячых ад яго на розных узроўнях гарыз. галінастых каналаў. Па рэштках С. вызначаюць узрост геал. адкладаў.

СТРАМІ́НСКІ (Стшамінскі) Уладзіслаў Максімілянавіч (21.11.1893, Мінск — 25.12.1952), бел. мастак; прадстаўнік авангарднага мастацтва. Зазнаў уплывы К.*Малевіча* і *супрэматызму*. Скончыў Маскоўскі кадэцкі корпус (1911), Ваен. інж. вучылішча ў С.-Пецярбургу (1914). У 1918—19 працаваў у Мінску, з 1920 у Смаленску, з 1922 у Вільні, з 1936 у Вілейцы (Мінская вобл.). З 1940 у г. Лодзь (Польшча), выкладаў (1945—50) у Вышэйшай маст. школе. Прапагандаваў рэв. авангард, стварыў смаленскі філіял аб'яднання *Сцвярджальнікі новага мастацтва*, суполкі «Блок» (1925), «Прэзенс» (1926), «A.R.» («Рэвалюцыйныя мастакі», 1929; усе з Г.Стажэўскім і інш.). Заснавальнік тэорыі унізму (маніфест «Унізм у жывапісе», 1928), у якой сцвярджаў, што адзіная значнасць карціны — яна сама, а жывапіс, матэрыял, колер, форма, фактура і інш. павінны ўяўляць адзінае цэлае. Сярод твораў: «Архітэктанічная кампазіцыя 9с» (1929), «Пейзаж Лодзі» (1931), «Мора. Марскі пейзаж» (1933), «Уністычная кампазіцыя 14» (1934), цыклы «Дэпартацыя», «Грамадзянская вайна», «Таннае, як багна», «Тварыны», «Заходняя Беларусь», «Вайна дамам», «Рукі, якія не з намі» і інш.

Я.Ф.Шунейка.

СТРАНАКО́Ў Пракоп Авяр'янавіч (6.6.1917, в. Грачухі Жлобінскага р-на Гомельскай вобл. — 12.10.1961), Герой Сав. Саюза (1943). Скончыў курсы мал. лейтэнантаў (1942), Вышэйшую афіцэрскую артыл. школу (1951). У Чырв. Арміі з 1938. У Вял. Айч. вайну з 1942 на Бранскім, Цэнтр., Бел. і 1-м Бел. франтах. Камандзір артыл. ўзвода лейтэнант С. з групай разведчыкаў вызначыўся ў кастр. 1943 пры вызваленні Лоеўскага р-на Гомельскай вобл., дзе пасля фарсіравання Дняпра карэкціраваў агонь артылерыі палка, удзельнічаў у адбіцці контратак ворага, у баях за пашырэнне плацдарма, замяніў параненага камандзіра роты і павёў байцоў роты ў атаку. Да 1958 у Сав. Арміі, потым у нар. гаспадарцы.



А.А.**Стральчонак**.

М.І.**Стралюк**.

П.А.**Странакоў**.

СТРАНІ́ЦКІ (Stranitzky) Іозеф Антон (каля 1676, г. Кнітэльфельд ?, Аў-



У.**Стрaмінскі**. Пейзаж Лодзі. 1931.

стрыя — 19.5.1726), аўстрыйскі акцёр, драматург; заснавальнік аўстр. прафес. т-ра. Вучыўся ў Лейпцыгскім ун-це, потым стаў акцёрам. Выконваў ролю Гансвурста — аўстр. разнавіднасць камічнага персанажа (блізкая італьян. Арлекіна); майстар пераўвасаблення, выкарыстоўваў востры нар. гумар. Выступаў як драматург (захавалася каля 14 яго камедый, у якіх значнае месца адводзілася імправізацыі), кіраўнік акцёрскіх труп. З 1706 працаваў у Вене, з 1712 арганізатар і кіраўнік першага аўстр. стацыянарнага т-ра (на ням. мове).



Странцыяніт.

СТРАНЦЫЯНІ́Т (ад месца знаходкі каля г. Строншыян, Strontian, у Шатландыі), мінерал класа карбанатаў, карбанат стронцыю, $SrCO_3$. Мае аксід стронцыю да 70,2%, прымесі кальцыю (да 13% CaO у кальцыястранцыяніце), барыю, свінцу.

Крышталізуецца ў рамбічнай сінганіі. Утварае зярністыя, шчыльныя і валакністыя агрэгаты, радзей ігольчастыя або прызматычныя крышталі. Бясколерны, снежна-белы, радзей з зеленаватым, жаўтаватым і шараватым адценнямі. Празрысты. Цв. 3,5. Шчыльн. 3,7 г/см^3. Крохкі. Паходжанне гідратэрмальнае жыльнае і экзагеннае. Руда на стронцый. Радовішчы ў Германіі, Мексіцы, Грузіі, на Украіне (Крым).

СТРА́СБЕРГ (Strasberg) Лі (17.11.1901, Нью-Йорк — 17.2.1982), амерыканскі акцёр, рэжысёр, педагог. Займаўся ў Амерыканскім лабараторным т-ры, дзе вывучаў сістэму Станіслаўскага, якая стала асновай яго выкладчыцкай дзейнасці. Творчую дзейнасць пачаў у 1925 як акцёр. Адзін з заснавальнікаў т-ра «Ґруп» (1931), з 1937 рэжысёр т-раў Брадвея, з 1948 педагог (з 1951 кіраўнік) Акцёрскай студыі ў Нью-Йорку. Сярод пастановак: «Дом Конелі» (1931) і «Джоні Джонсан» (1936) П.Грына, «Людзі ў белых халатах» С.Кінгслі (1933), «Пятая калона» Э.Хэмінгуэя (1940), «Сутыкненне ноччу» К.Одэтса (1941) і інш. Здымаўся ў кіно.

СТРАСБУ́Р, Страсбург (Strasbourg), горад на У Францыі. Адм. ц. дэпартамента Ніжні Рэйн і гал. горад гіст. правінцыі Эльзас. Каля 260 тыс. ж. (2001). Вузел чыгунак і аўтадарог, порт пры ўпадзенні р. Іль у Рэйн. Міжнар. аэрапорт. Прам-сць: маш.-буд., тэкст., дрэваапр., нафтаперапр., харчовая. Ун-т. Месца знаходжання *Савета Еўропы* (з 1949), *Еўрапейскага парламента*, Еўрап. суда па правах чалавека і інш. еўрап. устаноў.

Засн. стараж. рымлянамі ў 16 г. н.э. як ваен. лагер Аргентаратум. Назва С. вядома з канца 6 ст. Развіццю горада спрыяла яго зручнае геагр. размяшчэнне на перакрыжаванні гандл. шляхоў. З 498 у складзе Франкскай дзяржавы, з 843 — Латарынгіі, з 870 — Усх.-Франкскай дзяржавы, пазней — «Свяшчэннай Рым. імперыі». У 974—982 належаў сеньёру-біскупу. Каля 1150 атрымаў гар. права. У 1262 вызваліўся з-пад панавання біскупа, стаў імперскім горадам. З 1381 чл. Рэйнскага саюза гарадоў. У 15—16 ст. цэнтр ідэй *гуманізму* (С.*Брант* і інш.) і рэліг. Рэфармацыі; тут узнікла еўрап. кнігадрукаванне (гл. І.*Гутэнберг*). У 1621 засн. ун-т. З 1681 горад пад уладай Францыі (юрыдычна паводле *Рысвікскага міру 1697*), з 1682 адм. цэнтр яе прав. *Эльзас*. У 1871—1918 у складзе Герм. імперыі, адм. цэнтр яе зямлі *Эльзас-Латарынгія*. Пасля 1-й сусв. вайны паводле *Версальскага мірнага дагавора 1919* вернуты Францыі. У 2-ю сусв. вайну акупіраваны ням.-фаш. войскамі (1940—44).

Сярод помнікаў архітэктуры: гатычныя — сабор Нотр-Дам (11—16 ст.; познараманскі хор, 1176—1250; скульпт. ўбранне парталаў і гал. фасада, 13 ст.; вітражы 12—14 ст.), храмы Сен-Тама (13—14 ст.), Сен-П'ер-ле-В'ё (1381—1475) і інш., барочны епіскапскі палац (1722—28), ратуша (1730), жылыя дамы 14—17 ст., асабнякі ў стылі класіцызму. Музеі: прыгожых мастацтваў, археалогіі і дэкар. мастацтва (у палацы Раанаў, 18 ст.), «Эўр Нотр-Дам». Уключаны ЮНЕСКА у спіс *Сусветнай спадчыны*.

У.Я.Калаткоў (гісторыя).



Страсбур.
Набярэжная ракі Іль.



Страсбур. Сабор Нотр-Дам.

СТРА́СБУРГЕР (Strasburger) Эдвард (1.2.1844, Варшава — 19.5.1912), польскі і нямецкі вучоны ў галіне батанікі. Чл. Польскай АН у Кракаве (1888). Вучыўся ў Варшаве, Боне, Іене. З 1867 дацэнт Варшаўскага, з 1869 праф. Іенскага, у 1880—1911 Бонскага ун-таў. Навук. працы па цыталогіі, анатоміі і эмбрыялогіі раслін. Даследаваў мітоз. Апісаў меёз у вышэйшых раслін. Вывучаў працэс апладнення, партэнагенез і апагамію.

СТРАСЕ́ННЕ ГАЛАЎНО́ГА МО́ЗГА, пашкоджанне мозга пры мех. закрытай траўме галавы. У мозгу адзначаюцца дробныя кровазліцці, ацёк, парушэнне структуры і функцыі нерв. клетак. Праявы С.г.м.: галаўны боль, моташнасць, ірвота, галавакружэнне, *ністагм*, павышаны артэрыяльны ціск, зніжэнне крованапаўнення мазгавых сасудаў, парушэнне памяці; страта прытомнасці, слабы пульс, няроўнае дыханне. Лячэнне тэрапеўтычнае.

«СТРА́СЦІ ХРЫСТО́ВЫ», помнік бел. перакладной агіяграфічнай літаратуры канца 15 ст., легендарна-апакрыфічная аповесць пра Ісуса Хрыста. Змешчаны ў рукапісным зборніку разам з «*Аповесцю пра трох каралёў*» і «*Жыціем Аляксея, чалавека божага*». Перакладзена з лац. мовы з выкарыстаннем польскіх і чэш. крыніц, напісана дробным паўуставам. Пераклад зроблены католікам, вызначаецца высокай дакладнасцю і маст. дасканаласцю. Мова аповесці без царкоўнаславянізмаў, поўна адлюстроўвае жывую бел. мову таго часу. Асн. літ. кры-

ніца помніка — апакрыфічнае Евангелле ад Нікадзіма.

У цэнтры твора яркае, драматычна напружанае апісанне апошніх дзён жыцця, пакутніцкай смерці і ўваскрэсення гал. героя. Смерць Ісуса Хрыста пададзена з пункту гледжання царк.-рэліг. ідэйна-маст. канцэпцый хрысціянства як гераічны подзвіг і высакародная ахвяра ў імя лепшай будучыні ўсіх людзей. У аповесці створаны таксама вобраз Багародзіцы. Душэўныя перажыванні Божай маці, глыбокі боль за сына раскрыты ў псіхалагічна праўдзівых маналогах-плачах. Упершыню выдадзены М.М.Тупікавым у 1901. Зборнік зберагаецца ў Расійскай Нац. б-цы ў С.-Пецярбургу.

Публ.: Хрэстаматыя па гісторыі беларускай мовы. Ч. 1. Мн., 1961.

Літ.: Карский Е.Ф. Западнорусский сборник XV в. Императорской Публичной библиотеки в С.-Петербурге Q.I. № 391 // Карский Е.Ф. Труды по белорусскому и другим славянским языкам. М., 1962; Жураўскі А.І. Гісторыя беларускай літаратурнай мовы. Т. 1. Мн., 1967.

У.М.Свяжынскі, В.А.Чамярыцкі.

СТРА́ТА ў грамадзянскім праве, выяўленая ў грашовай форме шкода, якая нанесена адной асобе процілраўнымі дзеяннямі другой. Пад С. разумеюцца: выдаткі, якія асоба, чыё права парушана, зрабіла або павінна была зрабіць для аднаўлення парушанага права, страта або пашкоджанне яе маёмасці (рэальная шкода); неатрыманыя даходы, якія асоба магла атрымаць пры звычайных умовах грамадзянскага абарачэння, калі б яе права не было парушана (упушчаная выгада).

СТРАТАВУЛКА́Н (ад лац. stratum слой + *вулкан*), змешаны вулкан, палігенны вулкан са слаістай будовай, конус якога складзены з патокаў зацвярдзелай лавы і намнажэнняў рыхлага матэрыялу (абломкі лавы, бомбы, лапілі). Утвараецца пры чаргаванні вылівання лаў і ўзрыўной дзейнасці вулкана (напр., Ключаўская Сопка, Расія; Фудзіяма, Японія).

СТРАТАПА́ЎЗА (ад лац. stratum слой + pausa спыненне), пагранічны слой паміж *стратасферай* і *мезасферай* на выш. 50—55 км.

СТРАТАСТА́Т (ад *стратасфера* + грэч. statos нерухомы, стаячы), вышыны свабодны аэрастат, некіроўны *аэрастат* для пад'ёму ў стратасферу экіпажа і абсталявання для навук. або спарт. мэт; адзін з асн. лятальных апаратаў *паветраплавання*.

Складаецца з абалонкі (тканіна, плёначныя матэрыялы) для лёгкага газу (вадарод, гелій), *гандолы*, падвескі (прымацоўвае гандолу да абалонкі) і амартызатара для змяншэння штуршкоў у час прызямлення. З дапамогай С. вывучаюць спектр Сонца, зямны магнетызм, атм. вільготнасць, распаўсюджанне радыёхваль, інтэнсіўнасць касм. прамянёў і інш. У 1933 С. «СССР-1» (аб'ём абалонкі 25 тыс. м^3) падняўся на 19 км. Найб. выш. пад'ёму з экіпажам 34,7 км (1961, ЗША), без экіпажа — 52 км (1972, ЗША, аб'ём абалонкі 1,36 млн. м^3).

СТРАТАСФЕ́РА (ад лац. stratum слой + *сфера*), слой *атмасферы* паміж *трапасферай* і *мезасферай* на выш. ад 8—10 км (у высокіх шыротах) да 45—55 км (каля экватара). Характарызуецца малой турбулентнасцю, невял. колькасцю вадзяной пары, павышаным у параўнанні з ніжэй- і вышэйляжачымі слаямі ўтрыманнем азону (гл. *Азанасфера*). Ва ўмераных і палярных шыротах т-ра мала зменьваецца з вышынёй (прыкладна да 25 км), але далей пачынае расці. Над экватарам і тропікамі т-ра ўзрастае па ўсёй С. У залежнасці ад геагр. шыраты і пары года сярэдняя т-ра зменьваецца ад -40 °С (-80 °С) на ніжняй мяжы да блізкай да 0 °С на верхняй. У С. назіраюцца перламутравыя воблакі, тыповыя вял. скорасці ветру (да 80—100 м/с) і *струменныя плыні*.

СТРАТАТЫ́П (ад лац. stratum слой + грэч. typos адбітак, форма, узор), тыповы разрэз адкладаў стратыграфічнага падраздзялення (стратона), які з'яўляецца эталонам аб'ёму і межаў стратона пры карэляцыі. Адрозніваюць гала- (першасны), неа- (новы), гіпа- (дадатковы), пара- (паралельны) С.; пры нявысветленасці мяжы вылучаецца С. мяжы (ліміта́тып). На Беларусі мясц. стратыграфічныя падраздзяленні маюць свае С., створаны рэгіянальныя стратыграфічныя схемы (1981). *С.А.Кручак.*

СТРА́ТФАРД-ОН-А́ЙВАН (Stratford-on-Avon), горад у цэнтр. ч. Вялікабрытаніі, на Пд ад г. Бірмінгем, на р. Эйван. Вядомы з 691. Каля 120 тыс. ж. з прыгарадамі (2001). Месца нараджэння і смерці У.*Шэкспіра*: яго Дом-музей, да 1982 месцазнаходжаннне *Каралеўскай Шэкспіраўскай трупы*. Арх. помнікі 14—18 ст. Штогадовыя шэкспіраўскія фестывалі. Турызм.

СТРА́ТЫ ЭЛЕКТРАЭНЕ́РГІІ, частка электраэнергіі, якая траціцца ў элементах *электрычнай сеткі* на каронны разрад у ЛЭП, награванне токаправодных частак, намагнічванне і награванне асяродкаў трансфарматараў, статараў і ратараў эл. машын, а таксама паглынаецца ў дыэлектрыках кабеляў і кандэнсатараў.

Найбольшыя страты на карону, якая ўзнікае вакол правадоў ЛЭП у выніку кароннага разраду (гл. *Электрычныя разрады ў газах*). Асабліва значныя С.э. на ЛЭП пераменнага току вял. працягласці, звыш- і ультравысокага напружання. Зніжаюць іх павелічэннем дыяметра правадоў і адлегласці паміж імі. На ЛЭП звышвысокага (330 кВ і вышэй) напружання выкарыстоўваюць расчэпленыя правады — пучкі з некалькіх правадоў з адлегласцю паміж імі да 60 см. Правады ў пучках кожнай фазы ўтрымліваюцца ізаляцыйнымі распоркамі. З улікам С.э. робіцца выбар канструкцыі і разлік параметраў ЛЭП; эл.-тэхн. абсталявання.

СТРАТЫ́Г (грэч. stratēgos), у Візантыі з канца 7 ст. намеснік фемы (ваен.-адм. акругі), які валодаў у ёй ваен. і цывільнай уладай. З 11 ст. цывільныя функцыі ад С. перайшлі да суддзі або *прэтара*, а ваен. — да вышэйшых военачальнікаў (дукаў і катэпанаў), якія ўзначальвалі ўзбуйненыя фемы, а С. сталі нач. гар. і крапасных гарнізонаў. Ін-т С. знік у 12 ст. ў сувязі з распадам фемнай сістэмы.

СТРАТЫГРАФІ́ЧНАЯ ЗО́НА, храназона, падраздзяленне агульнай *стратыграфічнай шкалы*; частка *яруса*. Падзяляецца на падзоны. Вылучаецца паводле біястратыграф. даных і адлюстроўвае стадыю развіцця выкапнёвых груп фауны і флоры. Межы С.з. адбіваюцца па ніжнім і верхнім рубяжах стратыграф. пашырэння відаў жывёл і раслін, што хутка эвалюцыяніравалі і набылі шырокае распаўсюджанне (напр., комплексы грапталітаў, канадонтаў, аманітаў, фараміні́фер). Зоны выкарыстоўваюць для карэляцыі асадкавых адкладаў, вызначэння межаў і аб'ёму стратыграф. падраздзяленняў (сістэм, аддзелаў, ярусаў), высвятлення паўнаты геал. разрэзаў і аб'ёмаў перарываў у асадканамнажэнні. Геахраналагічны эквівалент С.з. — фаза (час). *С.А.Кручак.*

СТРАТЫГРАФІ́ЧНАЯ ШКАЛА́, сукупнасць (эталон) стратыграфічных падраздзяленняў (стратонаў), якія адлюстроўваюць паслядоўнасць напластавання геалагічных слаёў у часе. Існуюць С.ш. агульная (міжнар.), рэгіянальныя і мясцовыя. Таксанамічным адзінкам С.ш. (эанатэма, эратэма, сістэма, аддзел, ярус, зона) адпавядаюць адзінкі геахраналагічнай шкалы (эон, эра, перыяд, эпоха, век, фаза; гл. *Геахраналогія*). Для антрапагенавай (чацвярцічнай) сістэмы прыняты больш дробныя адзінкі С.ш. (раздзел, звяно, ступень) і іх геахраналагічныя эквіваленты: фаза, пара, тэрмахрон, крыяхрон. Гл. таксама *Стрататып*, *Стратыграфія*.

Падраздзяленні С.ш. адлюстроўваюць агульныя заканамернасці (этапнасць) развіцця літа- і біясферы ва ўзаемадзеянні паміж сабой і з інш. абалонкамі планеты. Агульныя стратоны ўстанаўліваюцца метадамі: для фанеразою (эратэма — зона) — біястратыграфічным і інш.; для антрапагенавай сістэмы (раздзел—ступень) — біястратыграфічным з кліматастратыграфічным і геамарфалагічным; для дакембрыю — паводле даных геахраналогіі (тэктанічная цыклічнасць, працэсы метамарфізму). Падраздзяленні агульнай С.ш. звязаны з падраздзяленнямі рэгіянальных і мясц. С.ш. і служаць для міжрэгіянальнай, міжкантынент. і планетарнай карэляцыі геал. цел. Асновы С.ш. закладзены ў 1-й пал. 19 ст., калі пры вывучэнні разрэзаў Еўропы палеанталагічным метадам была вылучана большасць геал. сістэм. Міжнар. С.ш. зацвярджаецца на сесіях Міжнар. геал. кангрэса. *С.А.Кручак.*

СТРАТЫГРА́ФІЯ (ад лац. stratum слой + ... *графія*), раздзел *геалогіі*, які вывучае паслядоўнасць утварэння горных парод і іх першасныя прасторавыя ўзаемаадносіны. Цесна звязана з гіст. геалогіяй, геахраналогіяй, палеанталогіяй, літалогіяй, геатэктонікай, геалогіяй карысных выкапняў і інш. Выкарыстоўвае палеанталагічны, літалагічны, кліматастратыграфічны, геахім., палеамагн., сейсмалагічны, прамысл.-геафіз., ізатопна-радыялагічныя (уран-свінцовы, калій-аргонавы, рубідый-стронцыевы, радыевугляродны) і інш. метады.

Як навука ўзнікла ў 17 ст. з адкрыцця дацкім вучоным Н.Стэна закону паслядоўнасці напластавання горных пород. У канцы 18 — пач. 19 ст. англ. вучоны У.Сміт распрацаваў прынцыпы палеанталаг. метаду ў С., што прывяло да ўзнікнення біястратыграфіі. Да канца 19 ст. вылучаны асн. стратыграф. падраздзяленні фанерозою (група, сістэма, аддзел, ярус), распрацаваны праект міжнар. стратыграф. шкалы. Уклад у развіццё С. зрабілі франц. вучоныя Э.Ог, М.Жынью, англ. У.Аркел, Р.І.Мурчысан, А.Седжвік, ням. О.Шындэвольф, амер. — К.Данбар, Х.Хедберг, рас. — А.П.Карпінскі, А.П.Паўлаў, Д.В.Наліўкін, У.В.Менер, Б.С.Сакалоў, А.І.Жамойда і інш., бел. — Л.М.*Вазнячук*, А.С.*Махнач*, А.В.*Фурсенка* і інш.

На Беларусі стратыграф. даследаванні пачаліся на мяжы 19—20 ст. з удзелам вучоных Расіі. Планамерныя работы вядуцца з 1927 (Ін-т геалогіі; М.Ф.*Бліадухо*). У 2-й пал. 20 ст. ў Ін-це геал. навук Нац. АН Беларусі і Бел. н.-д. геалагаразведачным ін-це распрацаваны і абгрунтаваны стратыграф. схемы тэр. Беларусі; удакладненні вядуцца пад кіраўніцтвам Стратыграфічнага к-та пры Бел. геал. т-ве.

Літ.: Степанов Д.Л., Месежников М.С. Общая стратиграфия. Л., 1979; Материалы по стратиграфии Белоруссии. Мн., 1981; Геология Беларуси. Мн., 2001.

С.А.Кручак.

СТРАТЫГРА́ФІЯ ў археалогіі, апісанне ўмоў залягання культ. пласта археал. помнікаў адносна геал. напластаванняў і інш. слаёў. Апісанне вядзецца па пластах зверху ўніз з пазначэннем характару глебы, прыродных і культ. уключэнняў, парушэнняў натуральнага залягання і інш. С. дае магчымасць вызначаць змену культ. комплексаў у часе і параўноўваць час існавання помнікаў у пэўным месцы («вертыкальная» С.). Калі розначасовыя рэчы трапляюцца ў адным гарызонце, выкарыстоўваюць «гарызантальную» С. «Параўнальная» С. — параўнанне розных археал. комплексаў — дае магчымасць вызначаць храналогію асобных культурных з'яў на тэр. асобных рэгіёнаў, краін, цэлых кантынентаў і нават усяго свету. З дапамогай звестак С. вызначаецца адносная, а потым і абсалютная храналогія каменнага веку і абгрунтоўваецца яго перыядызацыя. С. цесна звязана з глебазнаўствам і геалогіяй. *У.Ф.Ісаенка.*

СТРАТЫФІКА́ЦЫЯ МОЎ (ад лац. stratum слой + facere рабіць), суадносіны ўзаемадзеяння моў у выніку міграцыі, каланізацыі або завалявання аднаго народа іншым.

У залежнасці ад вынікаў узаемадзеяння моў вылучаюць тры стратыфікацыйныя тыпы: субстрат, суперстрат, адстрат. Субстрат — рэшткі мовы карэннага насельніцтва, якая была выцеснена мовай чужынцаў, але паўплывала на апошнюю і выклікала змены ў яе фанет. і грамат. ладзе, напр., балт., угра-фінскія дыялектныя рэлікты ў мовах усх. славян. Суперстрат — фанет. і грамат. элементы мовы прышлага народа, што праніклі ў мову карэннага насельніцтва, на якую паступова перайшлі чужынцы, напр., рэшткі стараж.-франц. мовы нарманскіх заваёўнікаў у англ. мове, цюркскія элементы — у балг. мове. Адстрат — элементы мовы іншаземнага народа ў мове карэннага насельніцтва, калі гістарычна захаваліся абедзве мовы, напр., ням. элементы ў мове лужыцкіх сербаў, індыйскія — у дравідскіх мовах. *А.Я.Міхневіч.*

СТРАТЫФІКА́ЦЫЯ НАСЕ́ННЯ, вытрымліванне насення ў вільготным субстраце для паскарэння яго прарошчвання; прыём перадпасяўной падрыхтоўкі. Выкарыстоўваецца гал. чынам для насення дрэвавых і кустовых пород, некат. лек. раслін. Насенне пераслойваюць вільготным пяском, пілавіннем, тарфяной крошкай, імхом і вытрымліваюць пры т-ры 3—5 °С на паветры. Працягласць С.н. ў пладовых дрэў 80—130 сутак.

СТРАТЭ́Г (грэч. stratēgos ад stratos войска + agō вяду), у старажытнагрэчаскіх полісах 6—1 ст. да н.э. военачальнік, надзелены шырокімі ваен. і паліт. паўнамоцтвамі. У Афінах існавала калегія з 10 С.: адзін — для камандавання гаплітамі (цяжкаўзброенай пяхотай), адзін — для падрыхтоўкі флоту, адзін — для аховы краіны, два — для аховы *Пірэя*; астатнія камандавалі войскамі ў паходах паводле строга вызначанай чаргі. Выбіраліся С. нар. сходам па аднаму ад кожнай філы (родаплемянное аб'яднанне) тэрмінам на 1 год (дазвалялася неаднаразовае выбранне — напр., *Перыкл* на працягу 15 гадоў). Пасада была безаплатнай. С. ўзначальвалі ваен.-паліт. саюзы (Фесалійскі, Эпірскі, Ахейскі і інш.). У Паўн. Прычарнамор'і калегіі С. вядомы ў Ольвіі і Херсанесе. Знешнім знакам адрознення С. былі асобая хламіда і вянок. Паводле некат. звестак, С. называліся военачальнікі таксама ў Егіпце і шэрагу краін М. Азіі. У сучасным значэнні С. — *палкаводзец*, кіраўнік буйных ваен. аперацый.

«СТРАТЭГІ́ЧНАЯ АБАРО́ННАЯ ІНІЦЫЯ́ТЫВА» («САІ»), доўгатэрміновая праграма стварэння шырокамаштабнай сістэмы проціракетнай абароны (ПРА). Прызначана для абароны краіны ад *ракетна-ядзернай зброі*. Уключае розныя сродкі паражэння ракет і боегаловак, у т.л. заснаваных на новых фіз. прынцыпах (гл. *Прамянёвая зброя*, *Пучковая зброя*). Значную ч. сістэмы ПРА складае *касмічная зброя*. «САІ» распрацавана і аб'яўлена ў ЗША у 1983; некат. элементы ПРА (процікасм. абароны) створаны ў Расіі, Ізраілі і інш.

СТРАТЭГІ́ЧНЫЯ ЎЗБРАЁННІ, віды зброі і ваен. тэхнікі, а таксама сродкі кіравання і забеспячэння, прызначаныя для рашэння стратэг. задач у вайне. Падзяляюцца на наступальныя і абарончыя. Аснова наступальнага С.ў. — наземныя комплексы стратэг. балістычных *ракет*, атамныя ракетныя падводныя лодкі, стратэг. бамбардзіроўшчыкі і інш. Абарончае С.ў. — сродкі процікасм. і *проціракетнай абароны*, комплексы з проціракетамі, сродкі кіравання і інш. С.ў. валодаюць ЗША, Расія, Вялікабрытанія, Кітай, Францыя. Асобныя іх кампаненты маюць таксама Украіна, Ізраіль і некат. інш. дзяржавы. *С.М.Абрамаў.*

СТРАТЭ́ГІЯ ВАЁННАЯ, састаўная частка *ваеннага майстэрства*, яго вышэйшая і важнейшая галіна. Ахоплівае тэорыю і практыку падрыхтоўкі краіны і ўзбр. сіл да вайны, планавання і вядзення вайны і стратэгічных аперацый. Асн. задачы С.в. і кірункі яе развіцця вызначаюцца канстытуцыяй і *ваеннай дактрынай* дзяржавы. Тэорыя С.в. як сістэма навук. ведаў вывучае заканамернасці і стратэг. характар вайны, а таксама спосабы яе вядзення; распрацоўвае тэарэт. асновы падрыхтоўкі і вядзення вайны (стратэг. аперацый). У галіне практычнай дзейнасці займаецца вызначэннем стратэг. задач узбр. сіл, неабходных для іх выканання сіл і сродкаў, распрацоўкай і ажыццяўленнем мерапрыемстваў па падрыхтоўцы ўзбр. сіл і ўсёй ваен. арганізацыі дзяржавы да вайны, планаваннем стратэг. аперацый, арганізацыяй стратэг. разгортвання ўзбр. сіл., а таксама маніторынгам і аналізам ваен.-эканам. магчымасцей імавернага праціўніка і інш. С.в. цесна звязана з палітыкай і абслугоўвае яе, адначасова аказвае адваротнае ўздзеянне на палітыку. Характар і змест С.в. у значнай ступені залежаць ад эканомікі. Узровень развіцця эканомікі, навукі і тэхнікі абумоўлівае магчымасць распрацоўкі і стварэння адпаведных сродкаў узбр. барацьбы, прадвызначае колькасны і якасны склад узбр. сіл. У сваю чаргу С.в. і ў мірны, і ў ваенны час аказвае адваротнае ўздзеянне на эканоміку. С.в., якая не ўлічвае рэальныя ваен.-эканам. магчымасці дзяржавы (кааліцыі дзяржаў), як правіла, церпіць паражэнне. Паводле адносін да інш. састаўных частак ваен. майстэрства (*аператыўнага майстэрства* і *тактыкі*) С.в. займае пануючае становішча. Яна вызначае іх задачы, спосабы дзеянняў войск у аператыўным і тактычным маштабе. Характар узаемасувязі састаўных частак ваен. майстэрства мяняецца з развіццём сродкаў вядзення ўзбр. барацьбы і аснашчэння імі ўзбр. сіл дзяржавы.

У войнах далёкага мінулага стратэг. поспехі цалкам залежалі ад тактычных. Са з'яўленнем аператыўнага майстэрства, якое заняло прамежкавае месца паміж стратэгіяй і тактыкай, тактычныя поспехі сталі весці да аператыўных, якія ў сукупнасці вызначалі стратэг. поспех. Са стварэннем *стратэгічных узбраенняў* сувязь паміж стратэгіяй, аператыўным майстэрствам і тактыкай набыла новы змест. Стратэг. камандаванне атрымала ў сваё распараджэнне такія сродкі паражэння праціўніка, выкарыстанне якіх дазваляе яму непасрэдна вырашаць важныя стратэг. задачы. Разам з тым аператыўнае і тактычнае камандаванні, маючы сучасныя сродкі паражэння, аказваюць больш значны ўплыў на дасягненне стратэг. мэт. На кожным гіст. этапе развіцця дзяржавы (кааліцыі дзяржаў) распрацоўваецца С.в. адпаведна яе палітыцы, эканам. магчымасцям і асаблівасцям ваен.-геагр. становішча.

У Рэспубліцы Беларусь С.в. адлюстроўвае дзярж. палітыку ў галіне абароны краіны, выходзіць з задач, вызначаных Канстытуцыяй і законамі Рэспублікі Беларусь, ваен. дактрынай, вызначае шляхі і спосабы іх выканання, прынцыпы ваен. будаўніцтва, падрыхтоўкі і вядзення вайны, ваен. арганізацыі дзяржавы, асновы яе развіцця

ных Канстытуцыяй, канцэпцыяй *нацыянальнай бяспекі* і ваен. дактрыны дзяржавы. Прыярытэтнай задачай С.в. з'яўляецца выпрацоўка мер ваен. плана па абароне дзярж. суверэнітэту і паліт. незалежнасці, забеспячэнні тэр. цэласнасці і недатыкальнасці граніц Рэспублікі Беларусь.

Літ.: Клаузевиц К. О войне: Пер. с нем. М., [1997]; Постижение военного искусства: Идейное наследие А.Свечина. М., 1999; Кладо Н.Л. Этюды по стратегии. М., 1997; Слипченко В.И. Бесконтактные войны. М., 2001; Кингстон-Макклори Э.Дж. Аспекты стратегии: Пер. с англ. М., 1966.

У.Ц.Шаўцоў, Г.А.Кавалёў, В.І.Рамязкоў.

СТРА́УС (Struthio camelus), птушка атр. страусападобных. Адзіны сучасны від атрада. Вывадкавая птушка. Пашыраны ў Афрыцы, раней трапляўся (да 1941) у Сірыі і на Аравійскім п-ве (вынішчаны). Жыве ў пустынях і стэпах, зрэдку з зараснікамі кустоў. Трымаецца групамі да 5—6, радзей да 30—40 птушак.

Найбольшы з сучасных птушак: выш. да 2,7 м, маса да 136 кг. Самец большы за самку. Апярэнне мяккае, у самца чорнае, махавыя і рулявыя пёры белыя, у самкі — шаравата-бурае. Галава і шыя пакрыты кароткім пухам. Не лятае; характэрны малыя памеры грудной косці і адсутнасць кіля. Ногі доўгія, моцныя, з 2 пальцамі. Хутка бегае (да 50 км/гадз). Палігам. 3—6 самак адкладваюць 6—8 яец (самыя вял. з птушыных) у агульнае гняздо. Расліннаедныя. Разводзяць на фермах (дзеля пёраў для ўпрыгожанняў і мяса).

СТРА́УСНІК, страусапёр (Matteuccia), род папарацей сям. анаклеевых. 3 віды. Пашыраны ва ўмераным поясе Паўн. паўшар'я. На Беларусі 1 від — С. звычайны (M. struthiopteris). Трапляецца ў вільготных лясах, уздоўж балот і ручаёў.



Страусні́к звычайны.

Травяністыя расліны выш. 60—100 см з тоўстым кароткім карэнішчам і з рэшткамі лісцевых чаранкоў на ім. Вегетатыўнае лісце зялёнае, з перыстарассечанымі сегментамі, даўж. да 1,7 м. Спараноснае лісце доўгачаранковае, з вузкімі сегментамі, нагадвае страусавае пяро (адсюль назва). *Спарангіі* ўкрыты пакрывальцам. *Гаметафіт* (зарастак) маленькі, слаявінны, зялёны, двухполы. Маладое лісце С. звычайнага ядомае. Лек. і дэкар. расліны.

А.М.Скуратовіч.

СТРА́УСЫ АМЕРЫКА́НСКІЯ, гл. *Нанду.*

СТРА́ЎНІК, орган *стрававальнай сістэмы*, дзе адбываецца мех. і хім. апрацоўка ежы ў пазваночных жывёл і чалавека.

Будова С. расліннаедных і драпежных пазваночных жывёл мае свае асаблівасці. У жвачных жывёл складаецца з рубца, сеткі, кніжкі і сычуга. У чалавека С. размяшчаецца пад дыяфрагмай, у левым падрабрынні. Злучаецца са страваводам праз кардыяльную (уваходную) частку. Мае шырокае дно і цела, больш вузкую выходную (піларычную) частку, злучаную з 12-перснай кішкой. Сценка С. мае слізістую (выдзяляе *страўнікавы сок*), падслізістую, мышачную і серозную абалонкі. Выконвае функцыі назапашвання, мех. і хім. апрацоўкі, правядзення ежы ў кішэчнік; таксама сакраторную, эндакрынную, усмоктвальную. Ёмістасць С. дарослага чалавека да 2,5 л.

А.С.Леанцюк.



Страўні́к чалавека: 1 — стрававод; 2 — кардыяльная (уваходная) частка; 3 — дно; 4 — цела; 5 — піларычная частка.

СТРА́ЎНІКАВЫ СОК, сакрэт, які выдзяляецца залозамі слізістай абалонкі *страўніка*. Удзельнічае ў *стравáванні*.

Бясколерная вадкасць. У саставе С.с. чалавека ферменты пратэіназы (пепсіназа, пепсін, гастрыксін і інш.), невял. колькасць ліпазы, саляная к-та і слізь (муцын). Гал. фермент — пепсін, які лепш функцыянуе ў кіслым асяроддзі. Кіслата змесціва страўніка абумоўлівае бактэрыцыдныя ўласцівасці, абясшкоджвае непатрэбныя бактэрыі і інш. мікраарганізмы, што трапляюць у арганізм чалавека з ежай. С.с. утрымлівае таксама ўнутр. антыанемічны фактар, што неабходны арганізму для засваення вітаміну B_{12}. Стымулюе выдзяленне гармонаў кішэчніка. Слізь С.с. ахоўвае сценку страўніка ад мех. і хім. раздражняльнікаў. За суткі ў чалавека выдзяляецца 2 л С.с. Колькасць і састаў мяняюцца ў залежнасці ад характару ежы, пры захворваннях органаў стрававання. У медыцыне выкарыстоўваецца С.с., атрыманы ад жывёл.

А.С.Леанцюк.



Страус афрыканскі: 1 — самка; 2 — самец; 3 — нага.

СТРАФА́ (грэч. strophē літар. — паварот) у вершаскладанні, рытміка-сінтаксічная еднасць двух ці больш вершаваных радкоў, звязаных найчасцей агульнай *рыфмай* або паўторам *клаўзул*.

У ант. паэзіі, якая не ведала рыфмаў, С. арганізоўвала метрыка — строга ўпарадкаванае размяшчэнне вершарадоў пэўных памераў (гл. *Антычные вершаскладанне*). У пазнейшым вершы, у т.л. ў сучасным сілаба-танічным, метрычная арганізацыя С. часткова засталася — у ёй нярэдка ў строгай паслядоўнасці паўтараюцца разнастопныя радкі аднаго памеру. Асн. ў страфічнай будове — рытмічная цэласнасць, якая прадвызначае аднароднасць рытмічнага малюнка ў межах, аналагічных С., а таксама інтанац.-сінтакс. еднасць, дзякуючы якой С. набываюць адносную сэнсавую завершанасць і самастой-

насць, выразна аддзяляюцца адна ад адной міжстрофнымі паўзамі, а на пісьме яшчэ і графічна (прагаламі). Розныя спалучэнні метрычнай, рытмічнай, інтанац.-сінтакс. будовы радкоў і рыфмоўка забяспечваюць вял. магчымасці страфічнай арганізацыі верша. Толькі рознае размяшчэнне ў С. вершаваных радкоў пэўных памераў і разнастайная рыфмоўка далі магчымасць М.Багдановічу стварыць 93 (паводле І.Ралько) віды С.

Характар С. залежыць ад ідэйнай задумы, намераў аўтара, яго схільнасцей, творчай культуры, канкрэтнага зместу і жанру твора. У лірычных вершах і паэмах С. звычайна простыя з 2, 3, 4 і 5 радкоў, а ў буйных вершаваных творах з развітай архітэктонікай — складаныя, у аснове якіх тыя ці інш. камбінацыі простых С. Аднолькавыя рыфмы застаюцца ў межах адной С., але ў некат. класічных формах яны своеасаблівым ланцужком звязваюць усе С., пераходзячы ад адной да другой, напр. у *тэрцынах*.

Наяўнасць пэўных відаў С. залежыць ад багацця нац. традыцый, сувязей роднай л-ры з л-рамі інш. народаў. У залежнасці ад колькасці радкоў адрозніваюць С. 2-радковыя (*двухрадкоўе, элегічны двуверш*), 3-радковыя (*трохрадкоўе*) і г.д. да дзесяціradкоўя. Асобныя простыя С., паўтараючыся ў розных камбінацыях, утвараюць новыя складаныя С.: адзінаццаціradкоўе, дванаццаціradкоўе, чатырнаццаціradкоўе (*анегінская страфа*), *шаснаццаціradкоўе*. Пераважаюць вершы, напісаныя аднолькавымі С. (*раўнастрофны верш*), аднак частка вершаў не дзеліцца на паасобныя С. і складаецца з 1 С. (*аднастрофны верш*) або некалькіх *страфоідаў*. Бывае, што ў творы адны С. змяняюцца другімі без відавочных заканамернасцей (*разнастрофны верш*) або С. адсутнічаюць (*астрафічны верш*). Асабліва багатая страфічная арганізацыя ў вершах Я.Купалы, Я.Коласа, Багдановіча, У.Дубоўкі, М.Танка, Р.Барадуліна, Н.Гілевіча, Я.Сіпакова. Пра страфічныя формы бел. верша гл. ў арт. *Страфіка*.

Літ.: Гл. да арт. *Вершаскладанне, Страфіка*.

В.П.Рагойша.

СТРАФО́ІД, група радкоў вершаванага твора з вольнай рыфмоўкай або без яе, завершаных па інтанацыйна-сінтаксічным малюнку і па думцы. С. ў большай ступені, чым *строфы*, валодаюць унутранай сэнсавай цэльнасцю і завершанасцю, бо характар С. вызначае не колькасць радкоў або парадак рыфмаў (як у строфах), а логіку разгортвання вобразна-паэт. думкі:

О, як лёгка ісці,
Адчуваючы матчыны рукі,
Адчуваючы крылы юнацтва,
Адчуваючы плечы каханай!

І як цяжка цягнуцца,
У далонях трымаючы толькі
Кульбаку ўспамінаў.

(М.Танк. «...О, як лёгка ісці»)

Найб. часта С. сустракаюцца ў паазметрычных вершах (*дольнік, тактавік, свабодны верш*).

В.П.Рагойша.

СТРАФО́ІДА (ад грэч. strophos кручаная стужка + eidos выгляд), алгебраічная крывая 3-га парадку. Апісваецца ўраўненнем ў дэкартавых каардынатах: $y^2 = x^2(a + x)/(a - x)$; сіметрычная адносна восі Ox; вяршыня ў пункце $A(-a, 0)$ і вузлавы пункт у пачатку каардынат; мае асімптоты $y = \pm x$. Уласцівасці С. даследаваў Э.*Тарычэлі* (1645).



Графік **страфоіды** $y^2 = x^2(a+x)/(a-x)$: прамая $x=a$ — асімптота; пункцір — датычныя ў вузлавым пункце $x = o$.

СТРАХ, 1) у псіхалогіі — адмоўная эмоцыя, што ўзнікае ў выніку рэальнай або ўяўнай небяспекі, якая пагражае жыццю арганізма, асобе, яе каштоўнасцям (ідэалам, мэтам, прынцыпам і інш.). Сфарміраваныя рэакцыі С. з'яўляюцца адносна стойкімі і здольныя захавацца нават пры разуменні іх бессэнсоўнасці. Таму выхаванне ўстойлівасці да С. звычайна накіравана не на пазбаўленне ад яго, а на выпрацоўку ўменняў валодаць сабой пры наяўнасці С. *Неафрэйдызм* разглядае С. як гал. крыніцу *неўрозу*. 2) Адно з асн. паняццяў *экзістэнцыялізму*. Уведзена С.К'еркегорам, які вылучаў звычайны «эмпірычны» С.-боязь, выкліканы канкрэтным прадметам ці абставінамі, і нявызначаны, неўсвядомлены С.-тугу — метафізічны С., які невядомы жывёлам, прадметам якога з'яўляецца нішто; ён абумоўлены тым, што чалавек смяротны і ведае пра гэта. У М.Хайдэгера С. адкрывае перад «экзістэнцыяй» яе апошнюю магчымасць — смерць. Метафізічны, экзістэнцыяльны С. Ж.П.Сартр тлумачыць як С. перад самім сабой, перад сваёй магчымасцю і свабодай.

СТРАХА́, у сялянскім буд-ве верхняя ч. хаты і гасп. пабудоў. Складаецца з апорных канструкцый (кроквы, латы) і пакрыцця. На Беларусі больш пашырана С. на кроквах: брусы верхнімі канцамі злучаны пад вуглом, а ніжнімі прымацаваны да бэлек або да верхняга вянка падоўжных сцен. Спарадычна трапляюцца (найб. у гасп. пабудовах) больш даўнія канструкцыі С. — *закотам*, на стаяках («на казлах», «на дзядках»), на сохах. С. бываюць 2-схільныя (пераважаюць на ўсёй этнічнай тэр.), 3- і 4-схільныя, з усечаным зверху (з *вальмай*, з залобкам) і знізу (з *прычолкам*) франтонам. Традыц. матэрыяламі пакрыцця: салома, чарот, дранка, гонта (упамінаецца ў дакументах з 16 ст.). З 20 ст. выкарыстоўваюць бляху, чарапіцу; у сучасным буд-ве пераважае шыфер. С. часта ўпрыгожваюць *вільчаком*. Прастору паміж С. і столлю (гарышча) выкарыстоўваюць для гасп. патрэб. Іл. гл. таксама да арт. *Дах*.

У.С.Гуркоў.

СТРАХАВА́ННЕ, грамадзянска-прававыя адносіны па абароне маёмасных інтарэсаў фіз. і юрыд. асоб пры наступленні пэўных падзей (страхавых выпадкаў) за кошт грашовых фондаў, што фарміруюцца з узносаў (страхавых прэмій), якія яны плацяць. Ажыццяўляецца на аснове дагавораў маёмаснага або асабістага С., якія добраахвотна заключаюцца грамадзянінам або юрыд. асобай (страхавальнік) з страхавой арг-цыяй (страхоўшчык). Дагавор (*страхавы поліс*) заключаецца ў пісьмовай форме. Паводле заканадаўства Рэспублікі Беларусь прадугледжваюцца выпадкі абавязковага С. жыцця, здароўя і маёмасці грамадзян за кошт сродкаў з адпаведнага бюджэту. С. прыватных інтарэсаў не дапускаецца. Не дапускаецца таксама С. страт ад удзелу ў гульнях, латарэях, закладах і ў выпадках, калі асоба была прымушана да страт з мэтай вызвалення заложнікаў. Парадак заключэння дагавораў С., іх ажыццяўленне, правы і абавязкі ўдзельнікаў С. рэгулююцца правіламі цывільнага кодэкса.

Г.А.Маслыка.



Тыпы каркаснай канструкцыі **стрэх**: а — на сохах; б — на паўсошках; в — на крыжах; г — на кроквах (1 — зволак, 2 — сохі, 3 — паўсошка, 4 — ключы, 5 — крыж, 6 — кроквы, 7 — латы).

СТРАХАВА́Я КАМПА́НІЯ, фінансавы інстытут, які ажыццяўляе *страхаванне* асобы, маёмасці, бізнесу ад фін. страт, якія выкліканы неспрыяльнымі здарэннямі або няшчаснымі выпадкамі. Гэта юрыд. асоба ці суб'ект гаспадарання, што дзейнічаюць на рынку на аснове ліцэнзіі і статута. Паводле прававой формы адрозніваюць прыватныя, акц., дзярж., узаемныя, муніцыпальныя С.к.; паводле характару аперацый — спецыялізаваныя, універсальныя, перастраховачныя, а таксама пенсіённыя фонды; паводле зоны абслугоўвання — лакальныя, рэгіянальныя, нац., міжнар. (транснац.).

СТРАХАВА́Я МЕДЫЦЫ́НА, форма мед. абслугоўвання і *сацыяльнага страхавання* насельніцтва. Засн. на абавязковым страхаванні працоўных з поўнай або частковай кампенсацыяй расходаў на мед. дапамогу з нац. фін. фондаў. Асн. крыніцы фінансавання: адлічэнні работадаўцаў на працоўных і плацяжы з бюджэту дзяржавы на непрацоўнае насельніцтва. Лячэбныя ўстановы выступаюць партнёрамі органаў сац. страхавання, якое забяспечвае стварэнне нац. фін. фонду С.м. Характэрна для большасці эканам. развітых краін. У 1990-я г. Расія перайшла да абавязковага мед. страхавання. На Беларусі С.м. фарміруецца.

І.М.Семяненя.

СТРАХАВЫ́ ПО́ЛІС, імянны дакумент, які выдаецца страхавальніку страхавой арг-цыяй (страхоўшчыкам) як засведчанне дагавору *страхавання*.

СТРА́ХАЎ Мікалай Мікалаевіч (28.10.1828, г. Белгарад, Расія — 5.2.1896), рускі філосаф, публіцыст, літ. крытык. Чл.-кар. Пецярб. АН (1890). Вучыўся ў Кастрамской духоўнай семінарыі (1840—44), Пецярб. ун-це (1845—48). Скончыў Гал. пед. ін-т (1851). Выкладаў прыродазнаўчыя дысцыпліны ў Адэсе і Пецярбургу. З 1861 супрацоўнічаў у час. «Время», «Эпоха», «Гражданин», «Библиотека для чтения», быў рэдактарам «Отечественных записок» і выдаўцом час. «Заря». З 1873 служыў у Пецярб. публічнай б-цы, з 1885 — у Вучоным к-це пры Мін-ве нар. асветы. У філас. працах «Пісьмы пра арганічнае жыццё» (1859), «Значэнне гегелеўскай філасофіі ў цяперашні час» (1860), «Свет як цэлае» (1872) на аснове рэліг. метафіз. *антрапацэнтрызму* і почвеніцтва абгрунтаваў ідэі адносна абмежаванасці і складана-іерархічнай будовы свету, а таксама нац. глебы («почвы») як асновы сац. і духоўнага развіцця Расіі. На яго думку, вяршыня іерархіі светабудовы — чалавек, ён займае цэнтр. месца па ўсіх напрамках сувязей, што злучаюць свет у адно цэлае. У мастацтве гал. лічыў узнаўленне нац. характару і вераванняў рус. народа. Вышэйшым ўзорам лічыў творчасць Л.М.Талстога, высока цаніў паэзію А.С.Пушкіна, А.А.Фета, Я.П.Палонскага, творы А.І.Герцэна, Ф.М.Дастаеўскага. Падрыхтаваў збор твораў А.А.Грыгор'ева (1876), напісаў 1-ю біяграфію Дастаеўскага і ўспаміны пра яго. Аўтар прац: «Пра асноўныя панятці псіхалогіі і фізіялогіі» (1886), «Пра вечныя ісціны: Мае спрэчкі аб спірытызме» (1887), «Вучэнне пра Бога на пачатках розуму» (1893), «Філасофскія нарысы» (1895) і інш. Перакладаў філас. і навук. працы Ф.Шэлінга, К.Фішэра, І.Тэна, Ф.Ланге.

Тв.: Переписка Л.Н.Толстого с Н.Н.Страховым, 1870—1894 // Толстовский музей. СПб., 1914. Т. 2.

Літ.: Левицкий С.А. Очерки по истории русской философии и общественной мысли. Т. 1. Франкфурт-на-Майне, 1983; Розанов В.В. Литературные изгнанники. Лондон, 1992.

С.Ф.Дубянецкі.

СТРА́ХАЎ Мікалай Міхайлавіч (15.4.1900, г. Болхаў Арлоўскай вобл., Расія — 13.7.1978), расійскі геолаг і геахімік; адзін са стваральнікаў сучаснай літалогіі. Акад. АН СССР (1953; чл.-кар. 1946). Скончыў Маскоўскі ун-т (1928). З 1934 у Геал. ін-це АН СССР. Навук. працы па пытаннях утварэння сучасных асадкаў і стараж. асадкавых парод і руд. Развіў і абгрунтаваў параўнальна-літалагічны метад тлумачэння ўтварэння стараж. асадкавых адкладаў. Вызначыў 4 тыпы літагенезу і прасачыў іх эвалюцыю ў гісторыі Зямлі; распрацаваў тэорыю дыягенезу, галагенезу і гумідная рудаўтварэння; даследаваў гаручыя сланцы, солі, жал. і марганцавыя руды, вапнякова-даламітавыя горныя пароды. Дзярж. прэмія СССР 1948. Ленінская прэмія 1961.

Тв.: Основы теории литогенеза. Т. 1—3. М., 1960—62; Геохимия осадочного марганцеворудного процесса. М., 1968 (у сааўт.); Развитие литогенетических идей в России и СССР. М., 1971.

СТРА́ЧА, рака ў Пастаўскім р-не Віцебскай вобл., Мядзельскім р-не Мінскай вобл. і Астравецкім р-не Гродзенскай вобл., правы прыток р. Вілія. Даўж. 59 км. Пл. вадазбору 1140 км^2. Выцякае з воз. Малыя Швакшты Пастаўскага р-на, цячэ на паўд.-зах. схілах Свянцянскіх град, упадае ў Вілію за 2 км на ПдУ ад в. Міхалішкі Астравецкага р-на. Цячэ праз ландшафтны заказнік *Блакітныя азёры*. Даліна ў верхнім цячэнні не выражана, на астатнім працягу трапецападобная. Пойма двухбаковая, забалочаная. Рэчышча моцназвілістае, у верхнім цячэнні камяністае, ёсць парогі; яго шыр. ў межань у верхнім і сярэднім цячэнні 8—12 м, у ніжнім 15—20 м. Каналізаванае на працягу 6,1 км. Каля в. Страча створана сажалка. Прымае сцёк з меліярац. каналаў.

СТРАЧО́К (Gyromitra), род сумчатых грыбоў сям. гельвелавых. 3 віды. Пашыраны ва ўмераным поясе Паўн. паўшар'я. На Беларусі 2 віды С.: асенні (G. infula) і звычайны (G. esculenta), які развіваецца вясной. Трапляюцца пераважна ў хваёвых лясах.

Пладовыя целы (*апатэцыі*) шапкавыя. Шапка няправільна-акруглая, звіліста-маршчакаватая, з глыбокімі складкамі, каштанава-карычневая, часам з прырослым да ножкі краем, пустая, шыр. да 30 см. Ножка няправільнай формы, пустая, крохкая, белая, часам з фіялетавым адценнем. Пладовыя целы маюць ядавіты таксін гірамітрын, колькасць якога залежыць ад умоў росту. Па ўздзеянні падобны на таксін *бледнай паганкі*. Споры эліпсоідныя, бясколерныя, з 2 кроплямі алею на канцах. Умоўна ядомы.



У.І.**Стржэльчык**.

«СТРА́ШНЫ СУД», у хрысціянскай *эсхаталогіі* суд, які канчаткова вызначыць лёс грэшнікаў і праведнікаў. Яго вытокі ў стараж.-егіп. вераванні ў замагільны суд Асірыса, на якім узважваюцца добрыя і злыя справы кожнага чалавека, і ў старазапаветным вучэнні пра «суд Яхве». У хрысціянстве «С.с.» звязваюць з другім прышэсцем Хрыста, які пасля завяршэння існавання чалавецтва здзейсніць суд над уваскрэслымі людзьмі. Вучэнне пра «С.с.» развівалася ў Евангеллях ад Матфея і Іаана, Апакаліпсісе, творах Яфрэма Сірына і інш.; замацавана ў хрысц. *сімвале веры*. Шэраг пратэстанцкіх кірункаў абвяргае літаральнае тлумачэнне «С.с.», а разглядае яго як сімвал, алегорыю. У ісламе «С.с.» адпавядае кіяма.

СТРЖЭ́ЛЬЧЫК Уладзіслаў Ігнатавіч (31.1.1921, С. Пецярбург — 11.9.1995), расійскі акцёр. Нар. арт. Расіі (1965). Нар. арт. СССР (1974). Герой Сац. Працы (1988). Скончыў студыю пры Ленінградскім Вял. драм. т-ры імя М.Горкага (1947). З 1938 акцёр гэтага т-ра (з 1992 т-р імя Г.Таўстаногава). У 1959—66 педагог Ленінградскага ін-та т-ра, музыкі і кінематаграфіі, у 1966—69 у Ін-це культуры. С. — майстар выразнага партрэта, высокай выканаўчай культуры. Сярод роляў: Цыганаў («Варвары» М.Горкага), Саламон («Цана» А.Мілера), Князь («Ханум» А.Цагарэлі), Гарадулін («На ўсякага мудраца хапае прастаты» А.Астроўскага) і інш. Здымаўся ў фільмах «Вялікі суддзя» (1958), «Вайна і мір» (1965—67), «Дзікае паляванне караля Стаха» (1979) і інш.



Страчок звычайны.

маўся ў кіно: «Вайна і мір», «Ад'ютант яго правасхадзіцельства», «Айцец Сергій», «Гардэмарыны, наперад!», «Тарцюф» і інш. Дзярж. прэмія Расіі 1971.

СТРО́БІЛ (ад грэч. strobilos хваёвая або яловая шышка), орган размнажэння некат. вышэйшых раслін: дзераза- і хвошчападобных, голанасенных. С. — відазменены ўкарочаны парастак, мае спецыялізаванае лісце — *спарафілы*, на якіх фарміруюцца спораўтваральныя органы — *спарангіі*. У разнаспоравых раслін С. дыферэнцыраваны на мікра- і мегастробілы. Відазменены лускападобны мегастробіл — насенная лускавіна хвойных раслін. Гл. таксама *Шышка*.

СТРО́ГАНАВЫ, расійскія купцы і прамыслоўцы, буйныя землеўладальнікі, дзярж. дзеячы і мецэнаты 16 — пач. 20 ст. З паморскіх сялян. У 1515 Анікей Фёдаравіч С. (1497—1570) засн. на р. Вычэгда саляны промысел. У 1558 цар *Іван IV* падараваў яму і яго нашчадкам землі па рэках Кама і Чусавая. Пазней С. захапілі і асвоілі новыя тэр. на Урале і ў Сібіры, дзе будавалі гарады і крэпасці, развівалі земляробства, солеварэнне і інш. промыслы. Унукі Анікея Максім Якаўлевіч (?—1620-я г.) і Мікіта Рыгоравіч (?—1620) спрыялі паходу ў Сібір у 1581—82 Ермака (гл. *Ярмак*), у 1610 атрымалі званне «імянітых людзей». У 1680-я г. ўсе ўладанні С. аб'яднаў Рыгор Дзмітрыевіч С. (1656—1715), які значна дапамог дзяржаве ў час *Паўночнай вайны 1700—21*, за што яго сыны Аляксандр, Мікалай і Сяргей атрымалі ад *Пятра I* тытул баронаў (1722) і ўвайшлі ў склад рас. арыстакратыі. Сярод іх нашчадкаў найб. вядомыя: Аляксандр Сяргеевіч С. (1733—1811), граф «Свяшчэннай Рым. імперыі» (1761), рас. граф (1798), прэзідэнт Акадэміі мастацтваў, чл. Дзярж. савета; яго сын граф Павел Аляксандравіч С. (1772—1817), таварыш (нам.) міністра ўнутр. спраў (1802—07); Сяргей Рыгоравіч С. (1794—1882), граф (1817), папячыцель (кіраўнік) Маскоўскай навуч. акругі (1835—47), маскоўскі ген.-губернатар (1859—60), старшыня *Маскоўскага таварыства гісторыі і старажытнасцей расійскіх* (1837—74), заснавальнік Строганаўскага маст. вучылішча (1825, цяпер Маскоўскі маст.-прамысл. ін-т); Рыгор Аляксандравіч С. (1770—1857), граф (1826), рас. пасланнік у Швецыі (1812—16) і Турцыі (1816—21); Аляксандр Рыгоравіч С. (1795—1891), граф, чарнігаўскі, палтаўскі і харкаўскі ген.-губернатар (1836—38), міністр унутр. спраў (1839—41). Многія са С. цікавіліся мастацтвам, л-рай, гісторыяй, археалогіяй, былі ўладальнікамі багатых бібліятэк і маст. калекцый. З іх прозвішчам звязана назва *Строганаўскай школы* 16 — пач. 17 ст.

СТРО́ГАНАЎСКАЯ ШКО́ЛА, стылістычны кірунак у рус. іканапісе канца 16 — пач. 17 ст. Назва ад прозвішча купцоў *Строганавых*, для якіх былі напісаны шматлікія абразы. Абразы С.ш. вылучаюцца невял. памерамі, мініяцюрнасцю, філіграннасцю пісьма, складанасцю кампазіцыі, фантастычнасцю



Да арт. **Строганаўская школа**. Абраз «Манастыр Зосімы і Савацця Салавецкіх». 17 ст.

пейзажных фонаў, грацыёзнай вытанчанасцю поз і жэстаў, сакавітай, шчыльнай колеравай гамай, узмоцненай актыўным выкарыстаннем золата і серабра. Большасць іх ствараліся маскоўскімі царскімі іканапісцамі. Сярод майстроў П.Чырын, Е.Масквіцін, Істома, Назарый і Нікіфар Савіны.

СТРОЙ (ваен.), вызначанае статутам размяшчэнне ваеннаслужачых, падраздзяленняў і часцей для іх сумесных дзеянняў у пешым парадку і на машынах. Забяспечвае арганізаванае і хуткае перамяшчэнне войск і кіраванне імі. С. мае *фронт*, тыльны бок, *фланг*і, шырыню і глыбіню. Асн. С. складаюць *шарэнгі* (лініі машын), калоны. Ваеннаслужачыя (падраздзяленні, часці, машыны) размяшчаюцца ў С. на ўстаноўленых інтэрвалах і *дыстанцыях*. С. бываюць аднашарэнгавыя і двухшарэнгавыя, паходныя, разгорнутыя, разамкнутыя і самкнутыя. Існуюць таксама С. караблёў (кільватэр, пеленг і інш.), С. самалётаў (змейка, калона, ромб і інш.).

С.А.Фамін.

СТРОЙ у музыцы, 1) суадносіны ступеней гукавой сістэмы па вышыні (частаце), выражаныя ў матэм. велічынях. С. абумоўлены рэгіянальнымі і гіст. асаблівасцямі муз. культур. Вядомы 17- і 24-ступенныя сістэмы ў музыцы арабскіх краін, 22-ступенны С. у Індыі, 7-ступенны піфагораў С. у Еўропе (у перыяд развіцця аднагалосся). Для хар. шматгалосся быў неабходны чысты (натуральны або тэрцава-квінтавы) С. Развіццё еўрап. ладагарманічнай сістэмы (павелічэнне колькасці танальнасцей, з'яўленне складаных акордаў, мадуляцый і г.д.) прывяло да нераўнамернай, а потым да раўнамернай 12-ступеннай тэмперацыі. С. з матэм. дасканалай фіксацыяй вышынь гукаў перадае норму гукавых суадносін. 2) Частата (вышыня) настройкі эталоннага тону гукараду (a^1 = 440 ваганняў за секунду). 3) Асаблівасць настройкі ці канструкцыі муз. інструмента (квінтавы С. скрыпкі, храматычны — баяна, натуральны — валторны). С. духавых інструментаў вызначае суадносіны паміж іх рэальным гучаннем і нотным запісам для іх (труба in B, кларнет in A). 4) Ступень зладжанасці паміж спевакамі ў хоры; характарыстыка хар. гучання. 5) С., або тон, тое, што *танальнасць* (устарэлае паняцце).

СТРОЙ у адзенні, традыцыйны комплекс бел. нар. адзення, характэрны для пэўнай мясцовасці. Гл. *Народныя строі*.

СТРО́КАЧ Пётр Паўлавіч (н. 22.3.1937, в. Матыкалы Брэсцкага р-на), бел. вучоны ў галіне інж. экалогіі. Канд. тэхн. н. (1973), праф. (1990). Скончыў Брэсцкі пед. ін-т (1960). З 1972 у Брэсцкім тэхн. ун-це (у 1976—80 і з 1990 заг. кафедры). Навук. працы па тэхналогіі ачысткі прыродных вод для гасп.-харчовых і тэхн. мэт. Распрацаваў тэхналогіі і ўстаноўкі для ачысткі вады ад арган. і завіслых рэчываў. Аўтар навуч. дапаможнікаў для ВНУ.

Тв.: Технология очистки природных вод. 2 изд. Киев, 1986 (разам з Л.А.Кульскім); Словарь терминов по химии и технологии воды. Брест, 1997.

СТРО́МА (ад грэч. strōma падсцілка), аснова органаў жывёл, якая складаецца з неаформленай злучальнай тканкі. У С. знаходзяцца валакністыя структуры, што абумоўліваюць яе апорнае значэнне, размяшчаюцца спецыфічныя элементы органаў, праходзяць крывяносныя і лімфатычныя сасуды. Таксама С. наз. бялковую аснову эрытрацытаў і пластыд, спляценне гіфаў, на якім размешчаны пладовыя целы або канідыяносцы ў сумчатых і недасканалых грыбоў.

А.С.Леанцюк.

СТРО́МБАЛІ (Stromboli), дзеючы вулкан у архіпелагу Ліпарскія а-вы, у Тырэнскім м., тэр. Італіі. Утварае аднайм. в-аў пл. 12,6 км². Выш. 926 м (ад дна мора каля 2700 м). Складаецца са стараж. разбуранага андэзітавага і сучаснага ўсечанага базальтавага конусаў. З перапынкамі ў 10—20 мін выкідае вулканічныя бомбы і распаленыя газы, якія відаць на вял. адлегласці, таму С. наз. маяком Міжземнамор'я. Зрэдку адбываюцца вывяржэнні базальтавай лавы. Ад С. паходзіць назва тыпу вывяржэння вулканаў — стромбаліянскі (гл. *Вулкан*).

СТРО́НГА, ландшафтны заказнік рэсп. значэння ў Баранавіцкім р-не Брэсцкай вобл. Засн. ў 1998 з мэтай аховы унікальнага прыроднага комплексу з папуляцыямі рэдкіх і знікаючых відаў. Пл. 12 015 га. Знаходзіцца на стыку Навагрудскага ўзвышша і Баранавіцкай водна-ледавіковай раўніны. Уключае далiны рэк Лахазва, Дзеравянка, Іса, іх прытокі і штучныя вадаёмы. Пад лясамі 94% тэр., пераважаюць хвойнікі верасовыя, бруснічныя, імшыстыя, чарнічныя, арляковыя; растуць бяроза, вольха чорная, елка, дуб, граб. У флоры шмат гаспадарча-карысных відаў раслін; 16 відаў сасудзістых раслін уключаны ў Чырв. кнігу: гарлянка пірамідальная, тлушчанка звычайная, званочак рапунцэль, купальнік горны, пальчатакарэннік майскі, сон лугавы, баранец звычайны, касач сібірскі і інш. У фауне 202 віды жывёл, з іх 24 у Чырв. кнізе: стронга ручаёвая, рак шыракапальцы, арлан-белахвост, скапа, паганка малая, бугай вялікі і малы, бусел чорны, уліт вялікі, гагара чорнаваллёвая, сыч касматаногі, соня арэшнікавая, барсук, рапуха чаротная і інш. Да аб'ектаў паляванне і промыслу адносяцца 22 віды млекакормячых. *П.І.Лабанок.*

СТРО́НГАВАЯ ГАСПАДА́РКА, сажалкавая рыбная гаспадарка, у якой вырошчваюць холадалюбівых рыб — радужную і ручаёвую *стронгу*. У С.г. ствараюць спрыяльныя для іх умовы: халодная вада (12—15 °С), добры гідрахім. рэжым (колькасць кіслароду 7—8 см^3/л), высокая праточнасць (500—1500 л/с на 1 га пл. вадаёма), камяністае дно. Стронга ў сажалках не размнажаецца, яе ікру штучна апладняюць і інкубіруюць. Адрозніваюць С.г. поўнасістэмныя, рыбагадавальнікі і нагульныя гаспадаркі. На Беларусі стронгу вырошчваюць у гаспадарцы «Стронга» Лагойскага р-на Мінскай вобл. і інш.

СТРО́НГІ, фарэлі, агульная назва прэснаводных форм *кумжы* (еўрап., або ручаёвыя, С.) і стальнагаловага ласося (радужныя С.). Пашыраны ў Еўразіі, Паўн. Афрыцы, Паўн. Амерыцы, акліматызаваны ў Аўстраліі, Новай Зеландыі, Паўд. Афрыцы і інш. У ручаях і рэках жывуць ручаёвыя С., у азёрах — азёрныя. На Беларусі 2 формы С.: ручаёвая (Salmo trutta morpha fario) у бас. рэк Вілія, Дняпро, Нёман, занесеная ў Чырв. кнігу, і радужная (S. irideus), завезеная ў 1956 для сажалкавых гаспадарак.

Даўж. да 122 см (радужная С.), маса да 30 кг (азёрныя формы), ручаёвай — да 70 см, маса да 12 кг. Колер — ад цёмнага да светлага; па ўсім целе і на спінным плаўніку чорныя і чырв. плямкі, у С. радужнай па баках цела — радужная паласа (адсюль назва). Кормяцца беспазваночнымі і дробнай рыбай. Аб'екты промыслу і развядзення. *М.В.Плюта.*

СТРОННІ́ЦТВА ЛЮДО́ВЭ (Stronnictwo Ludowe), сялянская партыя ў Польшчы, у т.л. ў Зах. Беларусі, у 1931—49. Створана ў выніку аб'яднання сял. партый «*Пяст*», «*Вызволене*» і *Стронніцтва хлопске*, што было звязана з узмацненнем апазіцыі «*санацыйнаму рэжыму*». Кіраўнікі партыі: Т.Начніцкі, В.Вітас, М.Ратай, С.Мікалайчык, І.Соляж, С.Тугут, В.Кавальскі, С.Мілкоўскі. Цэнтр. друкаваны орган — газ. «Zielony Sztandar» («Зялёны сцяг»). С.л. была звязана с Саюзам сельскай моладзі Польскай Рэспублікі (гл. «*Віцы*»). Асн. патрабаванні праграмы: зямельная і падатковая рэформы, скасаванне «нажніцаў цэн», увядзенне крэдытаў для сялян, нац. раўнапраўе і інш. У 1935—38 С.л. ўдзельнічала ў адзінафронтаўскіх дэманстрацыях у Беластоку, Сувалках, Баранавічах, Гродне, Слоніме, Гайнаўцы, Ваўкавыску, Крынках і інш., 10-дзённай забастоўцы сялян Зах. Беларусі і Зах. Украіны (жн. 1937), выступленнях супраць Бяроза-Картузскага канцлагера, за вызваленне з турмаў палітвязняў, супраць пагрозы вайны і інш. У 2-ю сусв. вайну кіраўніцтва С.л. ўвайшло ў склад польскага эмігранцкага ўрада і Рады Нарадовай. Узбр. атрады С.л. ў час ням.-фаш. акупацыі ўдзельнічалі ў нар. руху «Батальёны хлопске». У 1943 частка іх увайшла ў склад *Арміі Краёвай*, якая дзейнічала і на тэр. Зах. Беларусі. *Т.А.Лугачова.*

СТРОННІ́ЦТВА ХЛО́ПСКЕ (Stronnictwo Chłopskie), сялянская партыя ў Польшчы і Зах. Беларусі ў 1926—31. Створана ў выніку выступленняў групы дзеячаў з «*Вызволення*» на чале з Я.Домбскім. Кіраўнікі партыі Домбскі, В.Добрах, А.Плюта, Я.Табор, А.Валерон. Друкаваны орган — «Gazeta Chłopska» («Сялянская газета»). Асн. патрабаванні праграмы: парламенцкая рэспубліка, шырокая агр. рэформа, развіццё асветы сярод насельніцтва. Падтрымала дзярж. пераварот у Польшчы 12.5.1926. З 1928 вяла барацьбу супраць «*санацыйнага рэжыму*». Удзельнічала ў выступленнях за прадастаўленне дэмакр. свабод, правядзенне бурж.-дэмакр. рэформ. Пасля роспуску сейма ў 1930 некат. дзеячы партыі праследаваліся ўладамі, пачала расці яе апазіцыйнасць уладу. У 1931 С.х. аб'ядналася з сял. партыямі «*Пяст*» і «Вызволене» ў *Стронніцтва людовэ*. *Т.А.Лугачова.*

СТРО́НЦЫЙ (лац. Strontium), Sr, хімічны элемент II групы перыяд. сістэмы, ат. н. 38, ат. м. 87,62, адносіцца да *шчолачназямельных металаў*. Прыродны складаецца з 4 стабільных нуклідаў, найб. пашыраны ^{88}Sr (82,56%). У зямной кары $3{,}4\cdot10^{-2}$% па масе. Трапляецца выключна ў выглядзе злучэнняў; вядома каля 40 мінералаў С., найб. важныя — *цэлесцін* і *стронцыяніт*, ёсць С. ў прыродных мінералізаваных водах (прыблізна 24% агульных запасаў). Адкрыты ў 1790 англ. хімікам А.Крофардам, які вылучыў аксід С. са стронцыяніту (адсюль назва). Метал. С. атрыманы ў 1808 Г.*Дэві*.

Мяккі серабрыста-белы (неачышчаны залаціста-жоўты) метал. Існуе ў 3 паліморфных мадыфікацыях; пры т-рах ад пакаёвай да 248 °С устойлівы α-Sr (шчыльн. 2630 кг/м^3), $t_{пл}$ 768 °С. Хімічна вельмі актыўны (захоўваюць у закрытых шкляных пасудзінах пад слоем газы). На паветры пакрываецца плёнкай з аксіду SrO і пераксіду SrO_2, пры награванні загараецца. Узаемадзейнічае з вылучэннем вадароду з вадой [гідраксід Sr(OH)$_2$ больш моцная аснова, чым *кальцыю гідраксід*] і разбаўленымі мінер. к-тамі, з галагенамі, пры 300—400 °С з вадародам, пры t>400 °С з азотам, вугляродам, фосфарам, халькагенамі. Атрымліваюць электролізам расплаву хларыдаў С. ($SrCl_2$; 85%) і калію або амонію, алюматэрмічным аднаўленнем SrO пры 1000 °С у вакууме. Выкарыстоўваюць для легіравання спец. сплаваў (пераважна алюмініевых), як гетэр у электравакуумнай тэхніцы, злучэнні С.: аксід і карбанат — кампаненты аксідных катодаў электронна-вакуумных прыбораў, шкла для кінескопаў каляровых тэлевізараў, эмалей, палівы; нітрат і хларыд — кампаненты піратэхн. саставаў (афарбоўваюць полымя ў кармінава-чырв. колер); фтарыд — люмінафор, лазерны і аптычны матэрыял; тытанат $SrTiO_3$ — сегнетаэлектрык. Лішкі С. ў арганізме чалавека прыводзяць да пашкоджвання касцявой тканкі, печані і крыві, ГДК у вадзе 8 мг/л. Пры дзяленні ядраў урану ў ядз. рэактарах у значнай колькасці ўтвараюцца β-радыеактыўныя нукліды С.: ^{89}Sr (перыяд паў-



Стронгі: 1 — баджак, ці бахтак, летні; 2 — ішхан; 3 — радужная; 4 — ручаёвая; 5 — азёрная.

распаду $T_{1/2}$ = 50,5 сут) і ^{90}Sr ($T_{1/2}$ = 29,12 года), якія трапляюць у навакольнае асяроддзе пры выпрабаваннях ядз. зброі, аварыях на АЭС (гл. *Радыеактыўнае забруджванне*). Найб. небяспечны ^{90}Sr доўгі час знаходзіцца ў паверхневым слоі Зямлі, вызначаецца высокай міграцыйнай здольнасцю, назапашваецца ў касцявых тканках жывых арганізмаў (замяшчае кальцый), што прыводзіць да ломкасці касцей і інш. шкодных уздзеянняў.

А.П.Чарнякова.

СТРО́ФІКА, 1) раздзел паэтыкі, які вывучае спосабы спалучэння *радкоў вершаваных* у *страфу*, яе ўзнікненне, развіццё і мастацка-выяўл. магчымасці. 2) Сукупнасць страфічных форм асобнага твора, паэта і інш., пэўным чынам упарадкаваная сістэма радкоў і строф.

Зараджэнне бел. паэзіі звязана з *двухрадкоўямі* (упершыню ў Ф.Скарыны ў прадмове да кн. «Зыход», 1519) і *чатырохрадкоўямі* — катрэнамі (упершыню ў Скарыны ў прадмове да кн. «Іоў», 1517; у Афанасія Філіповіча «Дыярыушы», 1647). Багатая С. дэкламацыйнай Сімяона Полацкага. У 19 ст. С. бел. паэзіі ўзбагацілася творамі, напісанымі *пяцірадкоўямі* («Дзеванька» Я.Баршчэўскага), *шасцірадкоўямі* (ананімны «Я клічу Вас...»), *васьмірадкоўямі* (ананімны «Ой, у полі вецер вые...») і інш. Найб. інтэнсіўна ў бел. паэзіі С. развіваецца з пач. 20 ст. Больш разнастайнай стала структура строф, паглыбіўся яе рытміка-выяўл. магчымасці. Страфічны падзел тэксту падкрэсліваецца *рэфрэнам* («Мужык» Я.Купалы), выкарыстоўваецца кальцавая кампазіцыя («Як я полем іду...» Я.Купалы). Пашырыліся цвёрдыя формы верша (*тэрцыны*, *секстына*, *сіцыліяна*), засвоіліся *айрэны*, *газелі*, *рубаі* і інш., складаныя віды строф набылі значэнне самаст. відаў верша (*санет*, *трыялет*, *рандо*, *актава*), распаўсюдзіліся нізкі строф — *вянок санетаў*, *стансы*. Паявіліся віды строф, якія не маюць вял. пашырэння ў паэзіі: *сямірадкоўе* («Малебен» Я.Коласа), дзевяціradкоўе («Полымя» Я.Коласа) і інш. Своеасаблівай страфой напісана паэма Я.Коласа «Рыбакова хата» (складаецца з 12 радкоў з рыфмоўкай абабвгвгдеед). Асобныя віды строф сталі адметнымі для творчасці некат. паэтаў (*шаснаццаціradкоўі* А.Куляшова). У паэзіі пераважаюць вершы, напісаныя аднолькавымі строфамі — *раўнастрофныя вершы* («Беларусі» П.Броўкі). Сустракаюцца *аднастрофныя вершы* («Знаць хочаш, як я цябе знайшоў?» М.Танка), *разнастрофныя вершы* («Гапон» В.Дуніна-Марцінкевіча, «Мёртвая вясна» Броўкі), *астрафічныя вершы* і строфы, якія ўзніклі на матэрыяле пэўнага жанру, тэматыкі, стылю (баладная страфа, *элегічны двувершы*) і ў пэўнай ступені захоўваюць сувязь з імі. Аднак строфы звычайна не рэгламентуюцца памерам ці літ. жанрам, іх сэнсавыяўленчая роля вызначаецца зместам канкрэтнага твора.

Літ.: Лазарук М.А., Ленсу А.Я. Пытанні тэорыі літаратуры. Мн., 1964; Ралько І.Д. Беларускі верш. Мн., 1969; Грынчык М.М. Шляхі беларускага вершаскладання. Мн., 1973.

А.А.Майсейчык.

СТРО́ЦКІ Аляксандр Уладзіміравіч (н. 5.10.1952, в. Старое Сяло Мінскага р-на), бел. вучоны ў галіне уралогіі. Д-р мед. н. (1991), праф. (1997). Скончыў Мінскі мед. ін-т (1976). З 1981 у Бел. мед. акадэміі паслядыпломнай адукацыі. Навук. працы па анкалагічных уралагічных захворваннях, лячэнні дабраякаснай гіперплазіі прастаты, эндаскапіі і інш.

Тв.: Современные возможности и перспективы комбинированного и комплексного лечения опухолей мочевого пузыря (разам з В.А.Мохартам) // Вестн. АМН СССР. 1988. № 6; Современные подходы к лечению рака предстательной железы // Здравоохранение Беларуси. 1995. № 4.

СТРО́ЦЫ [Strozzi; прозваны Капучына (Cappuccino), а таксама Прэтэ Джэнавезе (Prete Genovese)] Бернарда (1581, г. Генуя, Італія — 2.8.1644), італьянскі жывапісец, прадстаўнік барока. Вучыўся ў Генуі ў П.Соры (1595—97). Зазнаў уплывы П.П.*Рубенса*, П.*Веранезе*. З 1597 капуцын, пісаў пераважна невял. абразы ў духу маньерызму. У 1610 атрымаў дазвол пакідаць кляштар для заняткаў мастацтвам, што паспрыяла станаўленню яго стылю, які вызначаўся свабоднай, сакавітай манерай пісьма, тонкасцю каларыту, гульнёй святлаценю, жыццёвай праўдзівасцю вобразнага ладу: карціны «Кухарка» (паміж 1615—18), «Рай» (1625), «Мадонна з дзіцем, святымі і анёламі» (1629), «Адрачэнне апостала Пятра», «Тлумачэнне сну Іосіфам», «Пакланенне пастухоў»; серыя партрэтаў; фрэскі ў палацы маркізаў Чэнтурыёні ў Сан-П'етра д'Арэна (1623—25), у касцёле Сан-Даменіка ў Генуі (1625) і інш. У 1630 адмовіўся вярнуцца ў кляштар, быў зняволены, пазней жыў у Венецыі, дзе стаў адным з буйнейшых партрэтыстаў (партрэт дожа Ф.Эрыца, 1631, і інш.). Сярод інш. твораў: размалёўка скляпення б-кі Марчыяна («Алегорыя Скульптуры», 1635), карціны «Баляванне ў Сімона Фарысея», «Выкраданне Еўропы», «Пакутніцтва святога Себасцьяна», «Святы Лаўрэнцій падае міласціну», «Мінерва», «Алегорыя Добрага імя» і інш. Паўплываў на развіццё генуэзскай і венецыянскай школ жывапісу.

С.У.Пешын.

СТРО́ЧКА Іван Іванавіч (н. 10.10.1919, в. Пажарышча Бешанковіцкага р-на Віцебскай вобл.), Герой Сав. Саюза (1944). Скончыў Вышэйшую афіцэрскую артыл. школу (1946), Ваен. артыл. камандную акадэмію (1956). У Чырв. Арміі з 1939. У Вял. Айч. вайну з 1941 на Паўд., 1-м і 4-м Укр. франтах, удзельнік баёў на Паўн. Каўказе, Украіне, у Польшчы. Камандзір узвода процітанк. гармат мал. лейтэнант С. вызначыўся ў жн. 1944 пры фарсіраванні Віслы каля г. Сандамір (Польшча) і абароне плацдарма. Да 1970 у Сав. Арміі, да 1994 на адм. рабоце.



І.І.**Строчка**.

СТРУ́ВЭ Васіль Васілевіч (2.2.1889, С.-Пецярбург — 15.9.1965), савецкі гісторык-усходазнавец. Акад. АН СССР (1935). Скончыў Пецярбургскі ун-т (1911), вучыўся ў Берліне. З 1916 выкладаў у Пецярбургскім ун-це, у 1918—33 заг. Егіпецкага аддзела Эрмітажа. Дырэктар Ін-та этнаграфіі (1937—40), Ін-та ўсходазнаўства АН СССР (1941—50). Даследаваў сац.-эканам. рабаўладальніцкія структуры стараж.-ўсх. грамадстваў, гісторыю і культуру Стараж. і эліністычнага Егіпта, Шумера, Вавіланіі, Асірыі, Ірана, Палесціны, Урарту, Паўн. Прычарнамор'я. Аўтар працы «Гісторыя Старажытнага Усходу» (1941). Адзін з ініцыятараў выдання Сав. гіст. энцыклапедыі.



Б.**Строцы**. Кухарка. Паміж 1615—18.

СТРУ́ВЭ Васіль Якаўлевіч (15.4.1793, Альтана, Германія — 23.11.1864), расійскі астраном і геадэзіст, заснавальнік Пулкаўскай астр. абсерваторыі. Акад. Пецярбургскай АН (1832, чл.-кар. 1822). Скончыў Дэрпцкі (Тартускі) ун-т (1810). З 1818 дырэктар Дэрпцкай, у 1839—62 Пулкаўскай абсерваторый.



В.Я.**Струвэ**.



П.Б.**Струвэ**.

Навук. працы па практычнай і зорнай астраноміі, астраметрыі і геадэзіі. Правёў першыя надзейныя вымярэнні паралаксаў 27 зорак (1837). Выявіў канцэнтрацыю зорак у галоўнай плоскасці Галактыкі, даказаў існаванне паглынання святла ў міжзорным асяроддзі і прапанаваў спосабы яго ўліку пры астр. назіраннях. З 1816 кіраваў астранома-геадэз. вымярэннямі некалькіх экспедыцый, вынікі работы якіх дазволілі вызначыць даўжыню дугі мерыдыяна ў 25°20′ ад р. Дунай да Паўн. Ледавітага ак., т.зв. дуга Струвэ.

Тв.: Рус. пер. — Этюды звездной астрономии. М., 1953; Дуга меридиана. М., 1957.

Літ.: Новокшанова (Соколовская) З.К. В.Я.Струве. М., 1964.

СТРУ́ВЭ Пётр Бернгардавіч (26.1.1870, г. Перм, Расія — 26.2.1944), расійскі філосаф, сацыёлаг, эканаміст, грамадскі і паліт. дзеяч. Унук В.Я.*Струвэ*. Ганаровы чл. Рас. АН (1917). Скончыў Пецярбургскі ун-т (1895). Рэдагаваў марксісцкія час. «Новое слово» (з 1897), «Начало» (з 1899). У 1898 удзельнічаў у складанні «Маніфеста І з'езда РСДРП» (надрук. ў г. Бабруйск), ад якога ў далейшым адрокся. З 1902 рэдагаваў час. «Освобождение». З 1905 адзін з арганізатараў і лідэраў *канстытуцыйна-дэмакратычнай партыі*. З 1907 дэп. 2-й Дзярж. думы. З 1906 выкладаў у Пецярбургскім політэхн. ін-це, адначасова з 1910 — на Бястужаўскіх жаночых курсах, у 1917 абараніў доктарскую дысертацыю. Пасля Лют. рэвалюцыі 1917 дырэктар эканам. дэпартамента Мін-ва замежных спраў. Пасля Кастр. рэвалюцыі 1917 удзельнік антысав. руху, член урада П.М.Урангеля. З 1920 у эміграцыі (Прага, Берлін, Бялград, Парыж), займаўся выкладчыцкай, навук. і паліт.-публіцыстычнай дзейнасцю. У эвалюцыі яго філас. поглядаў вылучаюць 3 перыяды: прытрымліванне «*легальнага марксізму*», адмаўленне тэорыі К.Маркса і пераход да *неакантыянства*, схіленне да плюралістычнага светапогляду. У цэнтры яго сінт. філасофіі — праблемы належнага і існага, свабоды і неабходнасці. Шляхам аналізу гэтых паняццяў прыйшоў да высновы, што існуе асобны свет з'яў, недаступны чалавечаму вопыту. Абгрунтаваў неабходнасць пераходу ад эмпірычнага вопыту да метафізікі, якая спалучае пазітыўныя веды і спасціжэнне тайны быцця. Адстойваў прынцыпы хрысціянска-дэмакр. маралі, заснаваныя на духоўнай роўнасці і свабодзе людзей. Сусв. парадак уяўляў як суму першасных, вечных, творчых матэрыяльных і духоўных элементаў. У аснове яго сац. поглядаў — ідэі ірацыянальнасці грамадства і гіст. працэсу і ўвасаблення рацыянальнага пачатку ў дзяржаве. Лічыў, што дзяржава мае містычную, звышразумовую прыроду. У якасці сац. ідэалу разглядаў ліберальную нац. дзяржаву. Сцвярджаў, што ў ідэальнай дзяржаве інтарэсы асобных грамадзян, сац. груп і класаў аб'ядноўваюцца на глебе нац. ідэі і служаць найвышэйшаму дзярж. інтарэсу. Крытыкаваў псіхалогію «дзяржаўнага адшчапенства», у якой абвінавачваў прадстаўнікоў дэмакр. інтэлігенцыі. Эканам. погляды С. грунтуюцца на ідэі здольнасці капіталізму да неабмежаванага прагрэсу і гарманізацыі розных сац.-класавых інтарэсаў. Заклікаў да перагляду эканам. палажэнняў марксісцкай тэорыі (тэорый вартасці, прыбавачнай вартасці, узнаўлення і інш.).

Тв.: Patriotica: Политика, культура, религия, социализм: [Сб.]. М., 1997; Избр. соч. М., 1999; Patriotica: Россия. Родина. Чужбина: [Сб. ст.]. СПб., 2000.

Літ.: Афанасьев М. Либеральная экономика Петра Струве // Вопр. экономики. 1994. № 12; Гнатюк О.Л. Консервативный либерализм и философско-социологическая методология «основного дуализма» П.Б.Струве // Социол. исслед. 1998. № 7. *В.І.Боўш.*

СТРУГ, 1) землярыйная машына бесперапыннага дзеяння для паслойнага зразання грунту. Працуе ў камплекце з адвальным мостам, канвеерам або грунтакідальнікам. Бываюць С. самаходныя і прычапныя да трактара. Выкарыстоўваюцца пры буд-ве каналаў, планіровачных работах вял. аб'ёму, нарэзцы кюветаў, ачыстцы чыг. пуцей ад снегу (пуцявыя С.). 2) Рабочае абсталяванне экскаватараў для выемкі (зразання) тонкіх пластоў карысных выкапняў у кар'еры. 3) Рабочы орган стругавай установкі для падземнай здабычы карысных выкапняў. 4) Пласкадоннае ветразевагрэбное судна ўсх. славян 6—13 ст. Быў меншы за *ладдзю*, умяшчаў да 12 чал. Пазней С. пачалі называць буйныя рачныя грузавыя судны тыпу *барак* грузападымальнасцю да 150 т. Хадзілі па Зах. Дзвіне. У 16—18 ст. невял. С. выкарыстоўвалі для аховы рачных гандл. караванаў. Мелі лёгкія гарматы, умяшчалі 60—80 стралкоў. 5) Інструмент для грубай апрацоўкі драўніны струганнем, агульная назва інструментаў для стругання (гл. *Стругі*). *С.В.Багдановіч.*



Струг (судна).

СТРУГ, бандарны інструмент для апрацоўкі клёпак і гатовых вырабаў у многіх народаў свету, у т.л. славян. Бывае з прамым або выгнутым лязом, з паралельна ці асіметрычна пастаўленымі ручкамі, што зручна пры вырабе абручоў, зрэзванні тарцовага краю бочак і інш. Выкарыстоўваецца і для першаснай апрацоўкі дрэва, пры вырабе гонты і інш. Гл. *Стругі*.



Стругі.

СТРУ́ГА, вёска ў Столінскім р-не Брэсцкай вобл., каля р. Гарынь. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 5 км на ПдУ ад г. Столін, 250 км ад Брэста, 14 км ад чыг. ст. Гарынь. 977 ж., 296 двароў (2001). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, амбулаторыя, аптэка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі.



Прычапны **струг**: 1 — нож; 2 — кідальнае прыстасаванне з адвальным мостам.

Царква. Брацкая магіла сав. воінаў. Каля вёскі славянскае паселішча 7—9 ст.

СТРУГА́ЛЬНЫ СТАНО́К, 1) у металаапрацоўцы — *металарэзны станок* для апрацоўкі (*стругання*) разцамі плоскіх і фасонных лінейчастых паверхняў.

Адрозніваюць падоўжна-стругальныя [гал. рух робіць выраб (загатоўка), прывод стала звычайны ад рэверсіўнага рухавіка] і папярочна-стругальныя (гал. рух робіць разец разам з супартам і паўзуном, прывод мех. ці гідраўл.). На базе падоўжна-стругальных вырабляюцца камбінаваныя станкі, у якіх струганне спалучаецца з фрэзераваннем і шліфаваннем.

На Беларусі папярочна-стругальныя станкі выпускаў Гомельскі станкабуд. з-д імя Кірава, падоўжна-стругальныя вырабляе Мінскі станкабуд. з-д імя Кастр. рэвалюцыі.

2) У дрэваапрацоўцы — *дрэварэзальны станок* для фарміравання гладкай плоскай паверхні дэталі (цыклявальны станок) ці для атрымання паўфабрыкату, напр., стругальнай шпоны (шпона-стругальны, стружкавы станок і інш.).

СТРУГА́ННЕ, спосаб апрацоўкі матэрыялаў рэзаннем, які заключаецца ў зняцці стружкі пастаяннай таўшчыні пры адносным зваротна-паступальным руху інструменту і загатоўкі.

Рэзанне ў дрэваапрацоўцы на *стругальных станках* па сутнасці — фрэзераванне (рэзальны інструмент робіць вярчальны рух), а на лушчыльных станках, у якіх верціцца загатоўка, — тачэнне. Асн. недахопы С. — удар рэжучага інструменту ў пачатку кожнага рабочага ходу і наяўнасць халастога ходу, што зніжае стойкасць інструменту і прадукцыйнасць апрацоўкі. У металаапрацоўцы С. праводзіцца на стругальных станках, у дрэваапрацоўцы — ручным інструментам (стругамі) ці на дрэваапрацоўчых (фанерастругальных, цыклявальных і інш.) станках.

СТРУГА́ЦКІЯ Аркадзь Натанавіч (28.8.1925, г. Батумі, Грузія — 12.10.1991) і Барыс Натанавіч (н. 15.4.1933, С.-Пецярбург), рускія пісьменнікі-фантасты, браты, сааўтары. Аркадзь С. скончыў Ваен. ін-т замежных моў у Маскве (1949). Працаваў рэдактарам. Барыс С. скончыў Ленінградскі ун-т (1955). Працаваў у Пулкаўскай абсерваторыі. Друкуюцца з 1957. Навук.-фантастычныя аповесці «Краіна барвовых хмараў» (1959), «Цяжка быць богам» (1964), «Панядзелак пачынаецца ў суботу. Казка для навуковых супрацоўнікаў малодшага ўзросту» (1965), «Смоўж на схіле» (1966—68), «Пікнік на абочыне» (1972), «За мільярд гадоў да канца свету» (1976—77), «Кульгавы лёс» (1986), зб. апавяд. «Шэсць запалак» (1960), цыкл лірычных навел «Вяртанне» (1962), раман «Горад асуджаны» (1988—89) і інш. пра шляхі развіцця цывілізацыі і ролі асобы ў грамадстве. Іх прозе ўласцівы псіхалагізм, «рэалістычнасць» дэталей фантаст. свету, гратэск, гумар. П'еса С. «Жыды горада Піцера, або Невясёлыя гутаркі пры свечках» пастаўлена ў Бел. т-ры імя Я.Коласа і Магілёўскім абл. драм. т-ры (абодва 1991).

Тв.: Собр. соч. Т. 1—11. Донецк; СПб., 2000—01.

СТРУ́ГІ, сталярныя інструменты для ручнога стругання драўніны — зрэзання тонкага слоя з яе паверхні. Бываюць для грубага і чыставога стругання (выгладжвання) плоскіх і крывалінейных паверхняў, для атрымання загатовак з фігурным профілем.

Найб. пашыраныя разнавіднасці С.: рубанкі (для састругвання лішкаў драўніны і атрымання роўных гладкіх паверхняў), фуганкі (для атрымання плоскіх паверхняў у даўгамерных загатовак), шархебелі (для грубай абдзіркі лішкаў драўніны), мядзведкі (для грубага стругання вял. паверхняў, напр., брусоў, абчасаных бярвён), шліфшыкі (для чыставога стругання цяжкаапрацоўвальнай драўніны), цынубелі (для надання дробнай шурпатасці апрацаванай паверхні), зензубелі і фальцгубелі (для выбаркі і зачысткі чвэрцяў і фальцаў), шпунтубелі (для выстругвання на дэталі прамавугольнага вузкага паза — шпунта), калёўкі (для профільнай апрацоўкі дэталей, атрымання фігурных паверхняў), грунтубелі (для выбаркі трапецападобнага паза ўпоперак валокнаў), гарбачы (для выбаркі пукатай або ўвагнутай крывалінейнай паверхні), *скоблі* (для здзірання кары з бярвён і грубага стругання). Гл. таксама *Дрэварэзальны інструмент*, *Сталярна-цяслярскі інструмент*.



Стругі: 1 — двайны драўляны рубанак; 2 — універсальны металічны рубанак-горбач; 3 — фуганак; 4 — драўляны шпунтубель; 5 — фальцубель; 6—9 — лёзы нажоў (прамое, нахіленае, авальнае, зубчастае цынубельнае).

СТРУ́ЕЎ Віктар Іванавіч (4.4.1864, Масква — 12.7.1924), бел. архітэктар. Скончыў Строганаўскае вучылішча і вучылішча жывапісу, скульптуры і дойлідства (1892) у Маскве. З 1893 у Мінску, епархіяльны архітэктар, у 1914 выкладчык малюнка ў жан. епархіяльным вучылішчы, інжынер буд. адзела губ. праўлення МУС, з 1915 губ. архітэктар. З 1920 архітэктар рэсп. пададдзела К-та дзярж. збудаванняў. У 1921 дэкан арх. аддзялення Мінскага арх.-буд. дарожнага тэхнікума, адначасова архітэктар Нар. камісарыята асветы, у 1923 акруговы архітэктар Зах. мытнай акругі, у 1924 Мінскі гар. архітэктар. Паводле яго праектаў узведзены: *Мінская царква Аляксандра Неўскага*, будынак *Мінскага царкоўна-археалагічнага музея*, званіца *Барысаўскага Васкрасенскага сабора*, мураваныя цэрквы ў г. Лунінец (1907), г.п. Любча (1908), вёсках Зембін Барысаўскага (1901), Камень Валожынскага, Мядзведзічы Ляхавіцкага (1904), Латыголічы Чашніцкага (1906), Тарасава Мінскага (1908) р-наў. У 1909—12 выканаў праекты мураваных будынкаў школ для гарадоў Тураў, Заслаўе, вёсак Ракаў Мінскага (узорныя), Даманавічы Салігорскага, Бабчын Хойніцкага р-наў. Распрацаваў 5 тыпавых праектаў царк.-прыходскіх школ (1912). *В.М.Чарнатаў.*

СТРУК, сухі шматнасенны плод раслін, што развіваецца з аднаго пладалісціка і раскрываецца 2 палавінкамі. Насенне размешчана ўздоўж шва. Характэрны для сям. струкавых.

СТРУК Васіль Аляксандравіч (н. 23.11.1949, г. Валожын Мінскай вобл.), бел. вучоны ў галіне матэрыялазнаўства. Д-р тэхн. н. (1989), праф. (1991). Скончыў Бел. тэхнал. ін-т (1971). З 1974 у Ін-це механікі металапалімерных сістэм АН Беларусі. З 1990 у Гродзенскім ун-це (заг. кафедры). Навук. працы па даследаванні трыбатэхн. з'яў пры стварэнні і эксплуатацыі металапалімерных сістэм, па тэхналогіі і матэрыялазнаўстве палімерных нанакампазітаў, функцыянальных матэрыялаў на аснове сумесей палімераў.

Тв.: Материалы на основе ненасыщенных полиэфиров. Мн., 1990 (разам з Г.Г.Калягай); Ингибиторы изнашивания металлополимерных систем. М., 1993 (разам з В.А.Гальдадэ, С.С.Пясецкім).

СТРУК Міхаіл Сямёнавіч (11.2.1922, в. Запясочча Жыткавіцкага р-на Гомельскай вобл. — 12.7.1975), поўны кавалер ордэна Славы. У Вял. Айч. вайну з 1941 на Ленінградскім, 2-м Бел. франтах. Разведчык яфрэйтар С. вызначыўся ў

чэрв. і вер. 1944 у Ленінградскай вобл. пры захопе палонных, у студз. 1945 пры прарыве абароны ворага на левым беразе р. Нараў (Польшча). Пасля вайны на с.-г. рабоце.

СТРУ́КАЎ Дзмітрый Міхайлавіч (1827?—1899), рускі мастак, археолаг, педагог. Скончыў Строганаўскае вучылішча ў Маскве. У 1849 заснаваў вучылішча малявання пры Троіца-Сергіевай лаўры (г. Сергіеў Пасад Маскоўскай вобл.). У 1864 ажыццявіў экспедыцыю па Беларусі, зрабіў замалёўкі помнікаў архітэктуры і краявідаў Магілёва, Маладзечна, Мінска [у т.л. Петрапаўлаўскай (Кацярынінскай) царквы], Нясвіжа, Полацка, Рагачова, мяст. Раманава (цяпер в. Леніна Слуцкага р-на) і інш., фрагментаў асобных збудаванняў, эпіграфікі, твораў выяўл. і дэкар.-прыкладнога мастацтва (у т.л. крыж Ефрасінні Полацкай). Праводзіў арх.-археал. пошукі на Беларусі і Украіне, у т.л. ў Крыме. Дзённікі, палявыя запісы, малюнкі С. — каштоўны матэрыял для вывучэння гісторыі бел. дойлідства.

А.А.Трусаў, Ю.А.Якімовіч.



Дз.**Струкаў**. Петрапаўлаўская (Кацярынінская) царква ў Мінску.

СТРУКАЧО́Ў, вёска ў Кармянскім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 15 км на ПдЗ ад г.п. Карма, 100 км ад Гомеля, 67 км ад чыг. ст. Рагачоў. 394 ж., 120 двароў (2001). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў.

СТРУКТУ́РА (ад лац. structura будова, размяшчэнне), сукупнасць устойлівых сувязей аб'екта, якія забяспечваюць яго цэласнасць пры знешніх і ўнутр. зменах. Уяўляе сабой спосаб узаемадзеяння элементаў сістэмнага ўтварэння, пры якім унутр. сувязі больш моцныя, чым знешнія, што абумоўлівае захоўванне якасных характарыстык *сістэмы*. У значнай ступені ўплывае на элементы сістэмы; часам адзін і той жа элементны састаў дзякуючы С. можа ўтвараць розныя сістэмы (напр., з'явы *ізамерыі* ў хіміі). Першапачаткова тэрмін «С.» ўжываўся ў навуцы для абазначэння формы. У 19 ст. ў сувязі з узнікненнем *хімічнай будовы тэорыі*, паняцце С. стала разглядацца як спосаб арганізацыі элементаў сістэмнага ўтварэння. З 20 ст. аналіз структурных адносін і сувязей займае значнае месца ў даследаваннях мовы, культуры, псіхалогіі, грамадства і інш. (гл. *Гештальтпсіхалогія*, *Структуралізм*, *Структурна-функцыянальны аналіз*). Паняцце С. цесна звязана з катэгорыямі *агульнай тэорыі сістэм* (сістэма, элемент, *цэласнасць*, *арганізацыя*) і *кібернетыкі* (*функцыя*).

М.І.Жукаў.

СТРУКТУ́РА ў матэматыцы, тэрмін, які аб'ядноўвае паняцці, дастасавальныя да *мностваў* з нявызначанай прыродай іх элементаў; адно з асн. паняццяў алгебры. Для вызначэння С. задаюць суадносіны паміж элементамі дадзенага мноства (характарыстыка тыпу С.) і пастуліруюць, што гэтыя суадносіны задавальняюць пэўныя ўмовы (аксіёмы). Напр., С. ўтварае мноства цэлых дадатных лікаў з аперацыямі вызначэння найб. агульнага дзельніка і найменшага агульнага кратнага, мноства рэчаісных лікаў з аперацыямі вызначэння большага і меншага лікаў з 2 зададзеных. С. выкарыстоўваюцца ў матэм. логіцы, тэорыях імавернасці, груп, мностваў, функцыянальным аналізе, тапалогіі і інш.

СТРУКТУ́РА ГЛЕ́БЫ, асобныя агрэгаты глебы, камякі розных памераў, формы, якаснага саставу, на якія яна распадаецца ў стане спеласці (гл. *Спеласць глебы*). Кожны агрэгат мае складаную будову, з'яўляецца комплексам мех. элементаў (гл. *Грануламетрычны склад глебы*), якія звязаны ў мікра- і макраагрэгаты гумусам, калоідамі, каранямі раслін і інш. Паводле формы агрэгатаў вылучаюць С.г. глыбістую, арахаватую, зярністую, слупчастую, прызматычную і інш. Ад С.г. залежыць *урадлівасць глебы*. Найб. аптымальная камякавата-зярністая С.г., памер агрэгатаў 0,25—10 мм. Разбураецца С.г. механічна пры шматразовай апрацоўцы, таксама ў выніку хім. і мікрабіял. працэсаў. Для аднаўлення С.г. сеюць шматгадовыя травы, уносяць арган. ўгнаенні і інш. На Беларусі пераважаюць дзярнова-падзолістыя бесструктурныя глебы.

СТРУКТУ́РА ГО́РНАЙ ПАРО́ДЫ, сукупнасць прыкмет горнай пароды, абумоўленая памерамі і формай мінер. зерняў, ступенню крышталічнасці, спосабам спалучэння крышталяў паміж сабой і з вулканічным шклом і інш.; адна з гал. дыягнастычных і класіфікацыйных прыкмет горных парод. Абумоўлена паходжаннем пароды і выкарыстоўваецца для яго вызначэння.

Паняцце сфармуляваў швейц. мінералог У.Грубенман у 1904, удакладніў і развіў сав. вучоны А.М.Заварыцкі. Вылучаюць зярністую, шклаватую, парфіравую і інш. структуры. Марфал. адзінкай структуры з'яўляецца мінер. зерне. Даследуецца пад мікраскопам у *шліфах*. Цесна звязана з *тэкстурай горнай пароды*.

СТРУКТУ́РА МЕТА́ЛУ, унутраная будова *металу* (сплаву). Адрозніваюць макра- і мікраструктуру. Макраструктуру назіраюць няўзброеным вокам ці праз лупу, што дае магчымасць выяўляць *дэфекты металаў*. Мікраструктуру вывучаюць з дапамогай аптычных ці электронных мікраскопаў, па ёй мяркуюць аб памерах, форме, узаемным размяшчэнні зерняў розных фаз металу. Унутр. будову асобных зерняў даследуюць метадамі *электронаграфіі* і *рэнтгеноструктурнага аналізу*.

СТРУКТУ́РА ПАПУЛЯ́ЦЫІ, характар размеркавання асобін у прасторы, а таксама паводле палавых, узроставых і інш. марфалагічных і фізіялагічных адзнак; адзін з кампанентаў папуляцыйнай біялогіі. Адрозніваюць прастораву́ю, іерархічную, дэмаграфічную, сацыяльную С.п. і інш. Многія параметры С.п. абумоўліваюцца дынамікай колькасці асобін, што складаюць папуляцыю (у часе, прасторы), узаемадзеяннем асобін з абіятычнымі і біятычнымі фактарамі асяроддзя. Вывучэнне С.п. дазваляе распрацоўваць сродкі і спосабы рацыянальнага выкарыстання біял. рэсурсаў, прыродаахоўных мерапрыемстваў і інш.

Літ.: Майр Э. Популяции, виды и эволюция: Пер. с англ. М., 1974; Солбриг О., Солбриг Д. Популяционная биология и эволюция: Пер. с англ. М., 1982; Радкевич В.А. Экология. 3 изд. Мн., 1997.

СТРУКТУРАЛІ́ЗМ, кірунак у сацыягуманітарных навуках 20—21 ст., арыентаваны на выяўленне *структуры* грамадства і культуры і структурных узаемазалежнасцей паміж іх кампанентамі; сукупнасць тэарэтыка-метадалагічных падыходаў да сацыялагічнага і культуралагічнага аналізу грамадства і культуры, іх структурных узаемадзеянняў і асаблівасцей. Першапачаткова быў распрацаваны ў лінгвістыцы (гл. *Структурная лінгвістыка*), пазней пашырыўся ў этнаграфіі, антрапалогіі, сацыялогіі, псіхалогіі, культуралогіі і інш. Разглядае культуру і грамадства як сукупнасць знакавых сістэм (мова, навука, мастацтва, рэлігія, міфалогія, звычаі і інш.), якія апасродкуюць узаемаадносіны чалавека і соцыуму. Мэта структурнага аналізу пэўнага аб'екта — пошук унутр. заканамернасцей яго пабудовы, якія вызначаюць яго абстрактна-родавыя ўласцівасці і прыкметы. Структуралісты даследуюць усе з'явы, даступныя эмпірычнаму вопыту, як «эпіфеномены» (знешняе выяўленне глыбінных унутр. структур), імкнуцца гуманіт. ведам надаць статус дакладных навук, што абумоўлівае стварэнне строгага фармалізаванага паняційнага апарату С., схільнасць да лагічных і матэм. формул, выкарыстанне тлумачальных схем і табліц.

Асновы С. ў вывучэнні сацыякульт. з'яў закладзены *К.Леві-Стросам*, які пры даследаванні першабытнай культуры аб'яднаў лінгвістычны, семіятычны, этнаграфічны і філас. падыходы і сцвярджаў, што асн. кампаненты

соцыуму (шлюб, рытуалы, рэліг. вераванні, міфы і інш.) з'яўляюцца своеасаблівымі мовамі, якія неабходна вывучаць пры дапамозе структурнага метаду. Яго ідэі развіваў Р.Барт, які выкарыстоўваў структурны аналіз пры вывучэнні з'яў сучаснага еўрап. грамадства. Даследаванне бессвядомага ў чалавека на аснове С. прапанаваў Ж.Лакан, які звярнуў увагу на падабенства паміж структурамі мовы і механізмамі ўздзеяння бессвядомага; ён лічыў, што С. змяняе ўласцівы папярэднім філас. і сацыялагічным кірункам суб'ектацэнтрызм «дэцэнтраваннем». М.П.Фуко сцвярджаў, што індывідуумы не павінны разглядацца ў якасці суб'ектаў гісторыі, і абвясціў «смерць суб'екта» як вынік стварэння «двайнікоў» чалавека асн. феноменамі сучаснага грамадства; ён лічыў, што для адраджэння індывід. свабоды чалавека неабходна дэструкцыя сац. структуры і пошук пэўных альтэрнатыў. Новы этап у развіцці С. (постструктуралізм) звязаны з даследаваннямі Ж.Дэрыды, Ж.Дэлёза, Ф.Гватары, Ж.Бадрыяра, Ю.Крысцевай, Ж.Ф.Ліятара (Францыя); Дж.Х.Мілера, Х.Блума, П. дэ Мана (ЗША) і характарызуецца крытычным стаўленнем да рацыянальнага тлумачэння з'яў рэчаіснасці, рэлятывізмам і скептыцызмам.

Літ.: Мулуд Н. Современный структурализм: Размышления о методе и философии точных наук: Пер. с фр. М., 1973; Автономова Н.С. Философские проблемы структурного анализа в гуманитарных науках. М., 1977; Клименкова Т.А. От феномена к структуре. М., 1991; Фуко М. Слова и вещи: Археология гуманит. наук: Пер. с фр. СПб., 1994; Реале Дж., Антисери Д. Западная философия от истоков до наших дней: Пер. с итал. Т. 4. СПб., 1997; Эко У. Отсутствующая структура: Введение в семиологию: Пер. с итал. СПб., 1998; Французская семиотика: От структурализма к постструктурализму: Пер. с фр. М., 2000.

Я.М.Бабосаў.

СТРУКТУ́РНА-ФУНКЦЫЯНА́ЛЬНЫ АНА́ЛІЗ, тэарэтыка-метадалагічны кірунак у *сацыялогіі*, які зыходзіць з прыярытэту *сістэмнага аналізу* пры вывучэнні сац. рэальнасці, яе *структуры* і функцыян. сувязі яе элементаў. Тэарэт. асновы С.-ф.а. распрацоўвалі Э.*Дзюркгейм*, А.Р.Радкліф-Браўн, Б.К.Маліноўскі, В.*Парэта* і іх паслядоўнікі Т.*Парсанс*, Р.К.*Мертан*, К.Дэвіс і інш. Яны разглядалі грамадства, сац. з'явы і працэсы як цэласную *сістэму*, элементы якой узаемазвязаны і выконваюць пэўную функцыян. ролю ў адносінах адзін да аднаго і да сістэмы ўвогуле. Адрозніваюць С.-ф.а. як сацыялагічную тэорыю і як метад сац. даследавання. Як сацыялагічную тэорыю С.-ф.а. распрацоўвалі Парсанс, М.П.Фуко, Н.Дж.Смелсер, Дэвіс, С.Айзенштат і інш., якія асн. задачай сацыялогіі лічылі вывучэнне механізмаў, што забяспечваюць цэласнасць сац. структуры, а функцыянаванне грамадства і яго асобных падсістэм разглядалі з пункту гледжання выканання імі пэўнага комплексу функцыян. патрабаванняў. У аснове С.-ф.а. Парсанса — ідэя сац. парадку, які адлюстраваны ў імкненні сац. суб'ектаў да падтрымання раўнавагі сістэмы. Фуко, К.Леві-Строс гал. задачай С.-ф.а. лічылі выяўленне элементаў грамадскай сістэмы і вызначэнне іх асн. *функцый* у забеспячэнні цэласнасці грамадства. Як метад сацыяльнага даследавання С.-ф.а. распрацаваў Мертан. Унутры метаду С.-ф.а. існуюць 2 асн. падыходы: структурны (аналіз сац. структур) і функцыянальны (аналіз сукупнасці сац. функцый і вызначэнне структур, якія ажыццяўляюць пэўныя функцыі). Сумяшчэнне ідэі стабільнага функцыянавання грамадства, характэрнай для С.-ф.а., і ідэі развіцця прывяло да распрацоўкі ў 1960—70-х г. канцэпцыі неаэвалюцыянізму (Парсанс, Э.А.Шылз), паводле якой устойлівае развіццё сац. сістэмы патрабуе вырашэння 4 асн. праблем: атрыманне рэсурсаў з навакольнага асяроддзя і іх размеркаванне ўнутры сац. сістэмы (адаптацыя), мабілізацыя рэсурсаў для дасягнення пэўных мэт і вызначэнне парытэту паміж імі (метадасягненне), каардынацыя адносін унутры сістэмы (інтэграцыя), забеспячэнне індывідаў неабходнай матывацыяй (падтрыманне «цэласнага стандарту»). Найноўшыя версіі С.-ф.а. характарызуюцца сінтэзам шэрагу ідэй сацыялагічнай думкі. С.-ф.а. пашыраны ў галінах сацыялогіі палітыкі, сацыялогіі сям'і, сацыялогіі злачыннасці і інш.

Літ.: Дюркгейм Э. О разделении общественного труда: Метод социологии: Пер. с фр. М., 1996; Американская социологическая мысль: Р.Мертон, Дж.Мид, Т.Парсонс, А.Шюц. М., 1996; Парсонс Т. О структуре социального действия: Пер. с англ. М., 2000.

І.В.Катляроў.

СТРУКТУ́РНАЯ ІЗАМЕРЫ́Я, тып *ізамерыі*, абумоўлены рознай хім. будовай малекул.

Асн. віды С.і.: ізамерыя вугляроднага шкілета, абумоўленая розным парадкам сувязі атамаў вугляроду ў малекуле, напр., *бутаны* — *н-бутан* $CH_3CH_2CH_2CH_3$ і ізабутан $CH_3CH(CH_3)CH_3$; ізамерыя становішча, абумоўленая розным становішчам функцыян. груп або кратных сувязей у малекуле з аднолькавым вугляродным шкілетам, напр., 1-прапанол $CH_3CH_2CH_2OH$ і 2-прапанол $CH_3CH(OH)CH_3$. Разнавіднасць ізамерыі становішча — т.зв. ізамерыя ўзаемнага размяшчэння функцыян. груп -ці кратных сувязей, напр., *м*-дыгідраксібензол (*рэзарцын*) і *п*-дыгідраксібензол (*гідрахінон*), *амінакіслоты*. Гл. таксама *Таўтамерыя*.

СТРУКТУ́РНАЯ ЛІНГВІ́СТЫКА, сукупнасць поглядаў на мову і метады яе даследавання, у аснове якіх разуменне мовы як знакавай сістэмы з дакладна вылучанымі структурнымі элементамі (адзінкамі мовы, іх класамі і інш.) і імкненне да строга фармальнага яе апісання, што набліжаецца да дакладных навук; галіна *мовазнаўства*. Для С.л. характэрна асаблівая ўвага да структуры мовы як да сеткі адносін (проціпастаўленняў) паміж элементамі моўнай сістэмы (гл. *Апазіцыя* ў мовазнаўстве). Разглядаецца ў 2 кірунках мовазнаўства: асн. (агульная тэорыя навукі для лінгвістыкі — інфарматыка для лінгвістыкі) і прыкладным (лінгвістыка для агульнай тэорыі навукі — лінгвістыка для інфарматыкі). Лінгвістычныя універсаліі суадносяцца са знакавымі сістэмамі, генератыўнай лінгвістыкай, лінгвістычнай тыпалогіяй і інш.; матэматычныя методыкі — з інфарматыкай, аўтам. перакладам і інш.

Склалася ў 1920—30-я г. Пачалі яе Ф. дэ *Сасюр* (жэнеўская школа), М.С.Трубяцкой, Р.В.Якабсон (Маскоўскі і Пражскі гурткі), Л.Ельмслеў, В.Брэндаль (капенгагенская школа). Уклад у С.л. зрабілі І.А.Бадуэн дэ Куртэнэ, Е.Курыловіч, А.Марцінэ, Э.Бенвеніст, Л.Тэньер і інш.

На Беларусі ў галіне С.л. працавалі і працуюць А.В.Зубаў, Г.П.Кліменка, В.У.Мартынаў, А.Я.Міхневіч, Б.Ю.Норман, Б.А.Плотнікаў, А.Я.Супрун, Г.А.Цыхун і інш.

Літ.: Апресян Ю.Д. Идеи и методы современной структурной лингвистики. М., 1966; Мельчук И.А. Опыт теории лингвистических моделей «смысл ⇆ текст». М., 1974; Шенк Р.К. Обработка концептуальной информации: Пер. с англ. М., 1980; Мартынов В.В. Категории языка: Семиол. аспект. М., 1982; Ягож. Основы семантического кодирования: Опыт представления и преобразования знаний. Мн., 2001.

В.У.Мартынаў.

СТРУКТУ́РНАЯ ПЕРАБУДО́ВА ЭКАНО́МІКІ ў Рэспубліцы Беларусь, сукупнасць мер па змене матэрыяльнай базы вытв-сці ці спосабу кіравання прадпрыемствамі, накіраваных на фарміраванне сістэмы грамадскай вытв-сці, якая найб. поўна адпавядае грамадскім патрэбам, забяспечвае дынамізм, збалансаванасць і высокую эфектыўнасць узнаўленчых працэсаў на базе паскарэння *навукова-тэхнічнага прагрэсу*, тэхн. рэканструкцыі. Асн. ўмова перабудовы — эфектыўная *інвестыцыйная палітыка*, якую ажыццяўляе ўрад. Яна ўключае: выдзяленне неабходных бюджэтных сродкаў на рэалізацыю агульнадзярж. праграм, павышэнне ролі фін. рэсурсаў прадпрыемстваў у капіталаўкладаннях (амартызацыйныя адлічэнні, прыбытак), прыцягненне замежных інвестыцый і крэдытаў у рэальны сектар эканомікі, сродкаў насельніцтва на будаўніцтва жылля, бюджэтна-падатковыя і цэнавыя пераўтварэнні і інш. С.п.э. на перспектыву намечана ў «Праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2001—2005 гады». Яе стратэгічная мэта — ўзмацненне сац. арыентацыі эканомікі, павелічэнне долі спажывання ў нац. даходзе, павышэнне дабрабыту народа. Гал. сродкі рэалізацыі прыярытэтаў: актывізацыя інавацыйнай і інвестыцыйнай дзейнасці, паскарэнне развіцця навукаёмістых і рэсурсазберагальных галін і вытв-сцей; развіццё жыл. буд-ва на неэмісійнай аснове з выкарыстаннем пазабюджэтных крыніц фінансавання; фарміраванне эфектыўнай сістэмы аховы здароўя; павелічэнне экспарту тавараў і паслуг; развіццё аграпрамысл. комплексу і звязаных з ім перапрацоўчых галін вытв-сці.

М.В.Радзіеўскі.

СТРУКТУ́РНЫЯ ГЕ́НЫ, участкі малекулы ДНК, якія вызначаюць паслядоўнасць амінакіслот у малекуле бялку ці

ферменту. У пракарыётаў у склад *апарона* ўваходзяць некалькі С.г., эўкарыётаў — адзін, які мае інфарматыўныя (экзоны) і неінфарматыўныя (інтроны) участкі. Экзоны ўтвараюць інфарм. РНК, дзе адбываецца зборка адпаведнай малекулы бялку. Функцыян. актыўнасць С.г. вызначае фенатыпічныя асаблівасці кожнага арганізма. *Р.Г.Заяц.*

СТРУМЕ́ННАЯ ПЛЫНЬ, паветраная плынь у выглядзе вузкага моцнага патоку ў верхняй *трапасферы* і ніжняй *стратасферы*, у палярных шыротах — і на больш нізкіх узроўнях; істотнае звяно агульнай *цыркуляцыі атмасферы*. Назіраецца ў вышынных франтальных зонах. Даўж. С.п. тысячы кіламетраў, верт. магутнасць да 10—15 км, шыр. сотні кіламетраў. Скорасць ветру больш за 30 м/с. С.п. частыя і ўстойлівыя ў субтрапічных зонах Паўн. і Паўд. паўшар'яў. Асабліва магутныя над Японскімі а-вамі, дзе ўтвараюцца вял. гарыз. кантрасты т-ры паміж ахалоджанай Азіяй і цёплым паветрам над паўн. ч. Ціхага акіяна.

СТРУМЕ́ННАЯ ПНЕЎМААЎТАМА́ТЫКА, тое, што *пнеўмоніка*.

СТРУМЕ́ННАЯ ПО́МПА, прыстасаванне для нагнятання (інжэктар) або адсмоктвання (эжэктар) вадкіх ці газападобных рэчываў, а таксама транспартавання гідрасумесей (гідраэлеватар).

Дзеянне С.п. заснавана на павелічэнні напампаванага (адпампаванага) рэчыва струменем вадкасці, пары ці газу. Адпаведна адрозніваюць вадка-, пара-, газаструменныя помпы. Асн. элеметы С.п.: рабочае сапло, прыёмная камера, камера змешвання, дыфузар. Выкарыстоўваюцца ў сістэмах падачы паліва лятальных апаратаў, у зварачных гарэлках і інш. *І.І.Леановіч.*



Схема **струменнай помпы**: 1 — падвод знешняга патоку асяроддзя; 2 — сапло; 3 — падвод асяроддзя, якое перапампоўваецца; 4 — камера змяшэння; 5 — дыфузар.

СТРУМЕ́ННАЯ ТЭ́ХНІКА, сукупнасць машын, апаратаў і прыстасаванняў, работа якіх заснавана на выкарыстанні кінетычнай энергіі вадкасці ці газу; тэхн. аснова *пнеўмонікі* і *гідрааўтаматыкі*.

Элементы С.т. бываюць аналагавыя (ці прапарцыянальныя) і дыскрэтныя; актыўныя (пастаянна злучаны з крыніцай сілкавання) і пасіўныя (выкарыстоўваюць энергію кіроўных сігналаў). Пабудаваны на прынцыпах розных аэрадынамічных эфектаў: узаемадзеянне свабодных струмянёў, турбулізацыя плыні ў асн. струмені ад дзеяння кіроўнага струменя, завіхрэнне струменяў і інш. Распрацаваны розныя функцыянальныя элементы, аб'яднаныя ў модулі. С.т., якія выконваюць складаныя лагічныя і выліч. функцыі. Для сувязі схем кіравання С.т. з рознымі выканаўчымі прыстасаваннямі выкарыстоўваюць пнеўмагідраўлічныя, пнеўмаэлектрычныя і інш. пераўтваральнікі сігналаў, а таксама пнеўматычныя ўзмацняльнікі ціску і расходу вадкасці ці газу.

Літ.: Соколов Е.Я., Зингер Н.М. Струйные аппараты. 3 изд. М., 1989; Лямаев Б.Ф. Гидроструйные насосы и установки. Л., 1988; Хрусталев Б.М., Кислов Н.В. Пневматический транспорт. Мн., 1998. *І.І.Леановіч.*

СТРУ́МЕНСКІ, біялагічны заказнік рэсп. значэння на тэр. Кармянскага р-на Гомельскай вобл. Засн. ў 1978 для аховы прыродных запасаў лек. раслін (чабор, цмен пясчаны, святаяннік прадзіраўлены, брусніцы, ландыш майскі і інш.). Пл. 12,3 тыс. га. Займае лясныя масівы, у якіх пераважаюць хвойнікі імшыстыя, чарнічныя, верасовыя, значныя ўчасткі бярэзнікаў, трапляюцца ельнікі чарнічныя. *П.І.Лабанок.*

СТРУ́МЕНЬ, комплекс археал. помнікаў (10 паселішчаў эпохі неаліту і бронзавага веку) каля в. Струмень Кармянскага р-на Гомельскай вобл. Выявіў у 1927 К.М.Палікарповіч. Паселішчы 1 і 6—7 даследавалі І.І.Арцёменка ў 1976 і А.Г.Калечыц у 1975—80. Знойдзены крамянёвыя пласціны, праколкі на канцах пласцін, адшчэпы, нуклеусы, разцы, скрабкі, сякеры, цёслы, наканечнікі стрэл, адходы крамянёвай вытв-сці, запасы сыравіны, фрагменты ляпнога посуду і інш. Выяўлены рэшткі 9 жытлаў, 68 гасп. ям, 54 агнішчы, 3 пахаванні. Помнікі адносяцца да верхнедняпроўскай, сяроднедняпроўскай і сосніцкай культур. *А.Г.Калечыц.*

СТРУМЕ́НЬ, форма цячэння вадкасці (газу) у асяроддзі (газе, вадкасці, плазме і інш.) з адрознымі ад яе параметрамі (скорасцю, т-рай, шчыльнасцю і інш.). Струменныя цячэнні класіфікуюць па найб. істотных прыкметах, што характарызуюць дадзены С., напр., разглядаюць С. кропельнай вадкасці, газу, плазмы і інш. Асобны іх клас — двухфазныя С. (газавыя, якія маюць вадкасныя ці цвердацельныя часціцы). Найб. пашыраны С., якія выцякаюць з сапла, трубы ці адтуліны. Гл. таксама *Струменная тэхніка, Струменная плынь.*

СТРУМЕ́НЬ Васіль (сапр. Лебедзеў Аляксандр Мікалаевіч; 1.4.1914, в. Лявонцьева Мантураўскага р-на Кастрамской вобл., Расія — 25.10.1992), бел. і ўкр. пісьменнік. Пісаў на бел. і ўкр. мовах. Скончыў Львоўскі пед. ін-т (1953). З 1921 жыў на радзіме айчыма ў в. Зачэпічы Дзятлаўскага р-на Гродзенскай вобл., дзе ў 1930 арганізаваў і ўзначаліў камсамольскую ячэйку. Неаднаразова быў арыштаваны польскімі ўладамі і зняволены ў астрозе. У 1939—79 на пед. рабоце ў Ровенскай і Валынскай абл. (Украіна). Друкаваўся з 1931 («Беларуская газета», «Літаратурная старонка», «Наша воля», «Асва») і інш. Пісаў пра цяжкае жыццё і барацьбу прац. Зах. Беларусі.

Тв.: У кн.: Сцягі і паходні. Мн., 1965; Дзень паэзіі-78. Мн., 1978; Ростані волі. Мн., 1990. *І.У.Саламевіч.*

СТРУМІ́ЛІН (сапр. Струмила-Петрашкевіч) Станіслаў Густававіч (29.1.1877, с. Дашкаўцы Ліцінскага р-на Вінніцкай вобл., Украіна — 25.1.1974), расійскі вучоны-эканаміст. Акад. АН СССР (1931). Герой Сац. Працы (1967). Скончыў Пецярбургскі політэхн. ін-т (1914). У 1921—36, 1943—51 у Дзяржплане СССР (нам. старшыні, нам. нач. Цэнтр. планавага бюро, Цэнтр. ўпраўлення нар.-гасп. ўліку). У 1921—23 у Маскоўскім ун-це. У 1929—30 у Ін-це нар. гаспадаркі. У 1931—57 у АН СССР, адначасова ў 1931—50 у Маскоўскім эканам. ін-це. Навук. працы па праблемах палітэканоміі, планавання нар. гаспадаркі, статыстыкі, эканомікі працы і дэмаграфіі, сацыялогіі, эканам. гісторыі і сусв. эканомікі. Пад яго кіраўніцтвам распрацавана сістэма матэрыяльных балансаў. Дзярж. прэмія СССР 1942. Ленінская прэмія 1958.

Тв.: Избр. произв. Т. 1—5. М., 1963—65; Статистика и экономика. М., 1979.



С.Г.**Струмілін**.



У.В.**Струмінскі**.

СТРУМІ́НСКІ Уладзімір Васілевіч (29.4.1914, г. Арэнбург, Расія — 22.2.1998), расійскі вучоны ў галіне аэрадынамікі, лятальных апаратаў і тэарэт. асноў самалётабудавання. Акад. Рас. АН (1966, чл.-кар. 1958). Герой Сац. Працы (1990). Скончыў Маскоўскі ун-т (1938). З 1966 дырэктар Ін-та тэарэт. і прыкладной механікі Сібірскага аддз. АН СССР, з 1971 у Ін-це праблем механікі Рас. АН. Навук. працы па віхравой тэорыі крыла, нелінейнай тэорыі ўстойлівасці, дынамічнай тэорыі турбулентнасці, кінетычнай тэорыі газаў, паляпшэнні лётных якасцей самалётаў. Стварыў тэорыі слізгальных і стрэлападобных крылаў, нестацыянарнага пагранічнага слоя. Даследаваў умовы пераадолення гукавога бар'еру, уплыў нестацыянарнасці на адрыў і абцяканне цел. Абагульніў кінетычную тэорыю Больцмана для апісання нераўнаважна-неаднародных асяроддзяў у моцных ударных хвалях і турбулентных патоках. Ленінская прэмія 1961. Дзярж. прэмії СССР 1947, 1948. Залаты медаль імя М.Я.Жукоўскага.

СТРУНА́, рака ў Астравецкім р-не Гродзенскай вобл. і Літве, правы прыток р. Страча (бас. р. Вілія). Даўж. 31 км (у межах Беларусі 18 км). Пл. вадазбору 194 км². Пачынаецца ў Літве, перасякае граніцу на ПнЗ ад хутара Рудня. Цячэ па паўн. схілах Свянцянскіх град, упадае ў р. Страча за 2 км на Пн ад в. Вял. Стаўпяняты. Даліна трапецападобная, шыр. 200—500 м у верхнім цячэнні, 1—1,5 км у сярэднім і ніжнім. Пойма вузкая. Рэчышча на працягу 10,3 км каналізаванае. У ніжнім цячэнні прымае сцёк з меліярац. каналаў.

СТРУНА́ ў тэорыі ваганняў, тонкая, гібкая, моцна нацягнутая нітка з раўнамерна размеркаванай па даўжыні шчыльнасцю.

Пры ўзбуджэнні С., напр. ударам ці шчыпком, адбываюцца вагальныя рухі, пры якіх усе ўчасткі С. зрушваюцца ў папярочным напрамку. Кожнае ваганне С. можна выявіць у выглядзе сумы яе гарманічных *уласных ваганняў*, частоты якіх f залежаць ад яе даўжыні l, плошчы сячэння S, сілы нацяжэння Q, шчыльнасці матэрыялу ρ, а таксама ад умоў замацавання канцоў. Для С., замацаванай на цвёрдых апорах, $f_n = \frac{n}{2l}\sqrt{\frac{Q}{\rho S}}$, дзе n — цэлы лік, адпаведны нумару гарманічнай складальнай. Зададзенае ў пачатковы момант размеркаванне зрушэнняў (спосаб узбуджэння С.) вызначае спектр узбуджаных уласных ваганняў. С. з'яўляецца самай простай *вагальнай сістэмай* з размеркаванымі параметрамі; ёй карыстаюцца для вывучэння ваганняў больш складаных мех., акустычных і эл. сістэм.

СТРУ́НІН Аляксандр Пятровіч (4.11.1909, г. Чыта, Расія — 23.4.1993), расійскі і бел. рэжысёр. Засл. дз. маст. Расіі (1960). Скончыў студыю пры драм. т-ры (Чыта, 1929). З 1925 акцёр і рэжысёр у т-рах Расіі. У 1952—54 рэжысёр Т-ра драмы і камедыі пры Белдзяржэстрадзе, у 1963—75 гал. рэжысёр Гродзенскага абл. драм. т-ра. Пастаноўкам уласцівы пафас жыццесцвярджэння, спалучэнне маст. формы з сац.-псіхал. накіраванасцю: «Порт-Артур» паводле А.Сцяпанава (1963), «Перабежчык» П. і А. Тур, «Сэрца на далоні» паводле І.Шамякіна (абодва 1965), «Алека Дундзіч» М.Каца і А.Ржашэўскага (1967), «Амністыя» М.Матукоўскага (1970), «Трыбунал» А.Макаёнка, «Навальніца» А.Астроўскага (абодва 1971), «Сірано дэ Бержэрак» Э.Растана (1972), «Апошні шанц» В.Быкава, «Дзядзечкаў сон» паводле Ф.Дастаеўскага (абодва 1975) і інш. Аўтар п'ес «Адплата» і «Я прысягаў Радзіме» (абедзве паст. ў 1968). *А.А.Лабовіч.*

СТРУ́НКА, рака ў Полацкім р-не Віцебскай вобл., правы прыток р. Зах. Дзвіна. Даўж. 21 км. Пл. вадазбору 123 км². Пачынаецца за 1 км на З ад в. Шылы, вусце каля в. Слабада. Рэчышча ад вытоку на працягу 4 км каналізаванае.

СТРУСЕ́ВІЧ Віталь Аляксандравіч (н. 4.6.1957, Мінск), бел. вучоны ў галіне матэм. кібернетыкі. Канд. фіз.-матэм. н. (1982), дац. (1987). Скончыў БДУ (1978), дзе і працаваў. З 1991 у Эразмскім ун-це (г. Ротэрдам, Нідэрланды; д-р філасофіі), з 1999 праф. Грынвіцкага ун-та ў Лондане. Навук. працы па тэорыі раскладаў, камбінаторнай аптымізацыі. Распрацаваў мадэлі, метады і алгарытмы пабудовы аптымальных раскладаў для шматстадыйных сістэм. Прэмія Ленінскага камсамола Беларусі 1990. Дзярж. прэмія Беларусі 1998.

Тв.: Теория расписаний. Многостадийные системы. М., 1989 (разам з В.С.Танаевым, Ю.Н.Сацковым); Scheduling theory: Multi-stage systems. Dordrecht, 1994 (з імі ж); Математические модели и методы календарного планирования. Мн., 1994 (з імі ж). *М.П.Савік.*



Возера **Струста**.

СТРУ́СТА, возера ў Браслаўскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Друйка, за 4 км на Пн ад г. Браслаў. Пл. 13 км², даўж. 6,4 км, найб. шыр. 4,2 км, найб. глыб. 23 м, даўж. берагавой лініі 27,8 км, пл. вадазбору 223 км². Уваходзіць у *Браслаўскую групу азёр* і нац. парк *Браслаўскія азёры*. Катлавіна складанага тыпу. Схілы выш. 5—8 м (на Пн 25—30 м), абразійныя, парослыя хмызняком і лесам, часткова разараныя. Берагі моцна парэзаныя (шмат заліваў), нізкія, пясчаныя і пясчана-галечныя, на Пн зліваюцца са схіламі. Дно складанай будовы, вылучаюцца 3 упадзіны, раздзеленыя мелямі і 7 астравамі (агульная пл. 2,58 км², найб. Чайчын, Шова, Бярозаўскія, Яленя). Прыбярэжная зона да глыб. 3 м пясчаная, пясчана-галечная, радзей гліністая і сапрапелістая. Глыбакаводная ч. выслана ілам і сапрапелем. Мінералізацыя вады да 200 мг/л, празрыстасць летам каля 5 м, зімой да 10 м. Мезатрофнае. Зарастае да 45% пл. возера. Да глыб. 6—7 м растуць харавыя водарасці, эладэя, рагаліснік, рдесты. На З упадае р. Акмяніца. С. злучана пратокамі з азёрамі Снуды, Балойса і Ельна. Сцёк праз пратоку ў воз. Войса.



Р.**Стручкова** ў ролі Папялушкі.

СТРУ́СТАЎСКІ ВАЛУ́Н, геалагічны помнік прыроды рэсп. значэння (з 1992). Размешчаны за 1 км на Пн ад в. Струста Браслаўскага р-на Віцебскай вобл., каля затокі воз. *Струста*. Чырвона-буры дробназярністы граніт рапаківі з крышталямі ружовага палявога шпату (авоіды 1—3 см). Даўж. 4,5 м, шыр. 4,4 м, выш. 1,5 м, у абводзе 13,8 м, аб'ём 16 м³, маса 42 т. Прынесены ледавіком каля 20—18 тыс. г. назад з Аландскіх а-воў Балтыйскага м. У старажытнасці меў культавае значэнне. На верхняй пляцоўцы захаваўся надпіс «R 1780».

В.Ф.Вінакураў.

СТРУЧКО́ВА Раіса Сцяпанаўна (н. 5.10.1925, Масква), расійская артыстка балета. Нар. арт. СССР (1959). Праф. (1978). Скончыла Маскоўскае харэаграфічнае вучылішча (1944). З 1944 салістка, у 1978—81 балетмайстар-рэпетытар Вял. т-ра ў Маскве. З 1995 маст. кіраўнік кафедры харэаграфіі Рас. акадэміі тэатральнага мастацтва. Сярод партый класічнага і сучаснага рэпертуару: Аўрора («Спячая прыгажуня» П.Чайкоўскага), Папялушка, Джульета («Папялушка», «Рамэо і Джульета» С.Пракоф'ева), Марыя, Жанна («Бахчысарайскі фантан», «Полымя Парыжа» Б.Асаф'ева), Тао Хоа, Параша («Чырвоны мак», «Медны коннік» Р.Гліэра). Знялася ў фільме-балеце «Хрустальны чаравічак» і

ў тэлеэкранізацыі балетаў «Паручнік Кіжэ», «Тваё імя». Яе творчасці прысвечаны тэлефільм «Танцуе Раіса Стручкова» і дакумент. фільм «Раіса Стручкова».

СТРУЧО́К, сухі шматнасенны паракарпны плод з 2 пладалісцікаў і з плевачнай перагародкай паміж плацэнтамі. Раскрываецца 2 палавінкамі па падоўжана-кальцавых трэшчынах у сценцы плода. Насенне застаецца на плацэнце, што абкружае перагародку. Характэрны для сям. крыжакветных.

СТРУЧО́ЧАК, пакарочаны *стручок*, які раскрываецца (напр., луннік, торбачнік) або не раскрываецца. Звычайна аднанасенны (напр., фарбоўнік).

СТРУ́ЭНСЕ (Struensee) Іаган Фрэдэрык (5.8.1737, г. Гале, Германія — 28.4.1772), дацкі дзярж. дзеяч. Граф (з 1771). З 1768 урач, фактычны дарадца псіхічна хворага дацкага караля Крысціяна VII. Пасля адстаўкі ў 1770 міністра замежных спраў Данії сканцэнтраваў у сваіх руках дзярж. ўладу. У 1771 тайны кабінет-міністр. Правёў шэраг рэформ у духу *асветнага абсалютызму* (роўнасць усіх перад судом, верацярпімасць, свабода друку, скасаваны катаванні і цялесныя пакаранні і інш.). У ноч на 17.1.1772 у выніку палацавага перавароту арыштаваны. Пакараны смерцю, а яго рэформы скасаваны.

СТРЫБО́Г, бажаство ўсходнеславянскай міфалогіі, ідал якога быў устаноўлены ў Кіеве ў 980. Упамінаецца пад 980 у «Аповесці мінулых часоў». У «Слове аб паходзе Ігаравым» вятры названы Стрыбогавымі ўнукамі, якія стрэламі павяваюць з мора, што, магчыма, паказвае на атмасферныя функцыі С. У стараж.-рус. тэкстах імя С. пастаянна спалучаецца з імем *Дажбога*, што дае падставу проціпастаўляць або збліжаць іх функцыі і значэнне.

СТРЫ́ГАВА, вёска ў Тэвельскім с/с Кобрынскага р-на Брэсцкай вобл., на аўтадарозе Кобрын—Камянец. Цэнтр калгаса. За 10 км на ПнЗ ад г. Кобрын, 56 км ад Брэста, 3 км ад чыг. ст. Тэўлі. 611 ж., 241 двор (2001). Прадпрыемства па перапрацоўцы люмінесцэнтных лямпаў. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Свята-Сямёнаўская царква (1808). Помнік у гонар 38-га егерскага палка, які 13.8.1812 каля С. адбіў наступленне напалеонаўскай кавалерыі. Брацкая магіла сав. воінаў.

СТРЫГАЛЁЎ Аляксандр Міхайлавіч (н. 24.3.1968, г. Перм, Расія), бел. паэт, перакладчык. Сын М.*Стрыгалёва*. Скончыў Літ. ін-т імя М.Горкага ў Маскве (1994). З 1997 працаваў на Бел. тэлебачанні, у друку, з 2000 у Аддзеле інфармацыі і грамадскіх сувязей УУС Мінскага аблвыканкома. Друкуецца з 1986. Піша на рус. мове. На некаторыя яго вершы напісаны песні. На рус. мову пераклаў кн. М.Мятліцкага «Бабчын» (1997, з М.Стрыгалёвым), паасобныя творы Я.Купалы, Я.Коласа, М.Танка, М.Багдановіча, П.Броўкі, А.Вярцінскага, У.Караткевіча, У.Някляева, Г.Пашкова, А.Пісьмянкова, А.Пысіна, Я.Янішчыц і інш.

Тв.: В саду вселенной: Стихотворения. Песни. Переводы. Мн., 2002.

СТРЫГАЛЁЎ Міхась (Міхаіл Лаўрэнцьевіч; н. 25.5.1938, в. Недайка Буда-Кашалёўскага р-на Гомельскай вобл.), бел. паэт. Скончыў БПІ (1961), Літ. ін-т імя М.Горкага ў Маскве (1969). Працаваў у Пермі (Расія). З 1978 на Беларусі. У 1980—82 сцэнарыст кінастудыі «Беларусьфільм». Друкуецца з 1956. Піша на бел. і рус. мовах. У зб-ках паэзіі «Хмель» (1966), «Белая Русь» (1967), «Колер часу» (1971), «Ростань» (1974), «Чырвоныя казармы» (1978), «Кола фартуны» (1981), «Дзевяты кардон» (1990), «Viqilia tertia. Трэцяя стража» (1999) грамадска-патрыятычныя і лірычныя матывы, любоў да роднага краю. Аўтар кніг для дзяцей. На бел. мову перакладае з рус., кампярмяцкай, на рус. — з аварскай, бел. (у т.л. кн. М.Мятліцкага «Бабчын», 1997, з А.Стрыгалёвым), удмурцкай і інш. моў.

СТРЫГА́ЛЬНАЯ МАШЫ́НА, машына для стрыжкі тканін, трыкатажнага палатна, штучнага футра. Выраўноўвае валокны па зададзенай вышыні, выдаляе з паверхні кончыкі валокнаў, нітак, вузельчыкі, пух. Мае хуткавярчальны цыліндр, на якім размешчаны стальныя востразаточаныя лопасці, т.зв. пёры, нерухомы стрыгальны нож і стол для падачы палатна. Бываюць падоўжныя (стрыгуць уздоўж тканіны) і папярочныя.

СТРЫГА́ЛЬНЫ АГРЭГА́Т, камплект абсталявання для стрыжкі авечак. Бывае эл. і механічны, размяшчаецца ў стацыянарных і перасоўных стрыгальных пунктах. Уключае стрыгальныя машынкі, эл. або мех. рухавікі для прыводу іх у дзеянне, інш. тэхнал. абсталяванне.

Найб. пашыраны эл. С.а. ЭСА-6/200 (на 6 стрыгальных машынак з убудаванымі асінхроннымі электрарухавікамі) і ЭСА-12/200 (на 12 машынак). Для індывід. гаспадарак і невял. ферм выкарыстоўваюць С.а. ЭСА-1ДІ з падвесным электрарухавіком (прыводзіць у дзеянне стрыгальную машынку праз гнуткі вал). У мех. С.а. стрыгальныя машынкі дзейнічаюць ад рухавікоў унутр. згарання.

В.М.Кандрацьеў.

СТРЫГІ́НЬ, вёска ў Бярозаўскім р-не Брэсцкай вобл., на левым беразе р. Ясельда, каля аўтадарогі Мінск—Брэст. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 8 км на ПдУ ад горада і чыг. ст. Бяроза, 106 км ад Брэста. 764 ж., 333 двары (2001). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Помнік архітэктуры — Свята-Іаана-Багаслоўская царква (1817).

СТРЫГО́ЛЬНІКІ, паслядоўнікі рэлігійнага ератычнага руху ў наўгародскапскоўскіх землях у 2-й пал. 14 ст., на чале якога стаяў дыякан Карп па прозвішчу Стрыгольнік (адсюль назва). Адмаўлялі ўвесь інстытут тагачаснай царквы: святароў, канстанцінопальскага патрыярха, царк. таінствы, догмат аб уваскрэсенні мёртвых. Ідэалам С. лічылі апостальскую царкву, і ў рамках першапач. хрысціянства ўстанаўлівалі годнасць чалавека, яго права быць настаўнікам веры ў жыцці. Духоўныя і свецкія ўлады ў 1375 утапілі лідэраў С. у р. Волхаў. Нягледзячы на смяротныя пакаранні, С. працягвалі дзейнасць і ў 1-й чвэрці 15 ст.

СТРЫГУ́ЧЫ ЛІША́Й, грыбковае захворванне скуры і валасоў, тое, што *мікраспарыя*.

СТРЫЕЎКА, рака ў Гродзенскім р-не, у бас. р. Нёман. Даўж. 24 км. Пл. вадазбору 145 км². Пачынаецца за 4 км на ПдЗ ад в. Парэчча, цячэ пераважна сярод лесу, упадае на ПнУ у воз. Рыбніца (бас. р. Котра). Рэчышча ад в. Перасельцы да вусця на працягу 1,7 км каналізаванае. Прымае сцёк з меліярац. каналаў.

СТРЫЕ́ЧНЫЯ БРАТ (СЯСТРА́), два юрадныя брат (сястра), дзеці родных братоў (сясцёр) у дачыненні адзін да аднаго.



Схема размяшчэння абсталявання **стрыгальнага агрэгата** ЭСА-12/200: 1 — заточны апарат; 2 — выключальнік; 3 — стрыгальная машынка; 4 — пераўтваральнік частаты току і напружання (з 50 Гц і 380 В на 200 Гц і 36 В).

СТРЫ́ЖАНЬ, 1) прадмет прадаўгаватай формы, які звычайна з'яўляецца воссю або апорай чаго-н. 2) У будаўнічай механіцы — канструкцыйны элемент, адзін з памераў якога (даўжыня) значна перавышае інш. (шырыню і вышыню). Прамалінейныя або крывалінейныя С., злучаныя паміж сабой, утвараюць *стрыжнёвыя сістэмы*. 3) С. ліейны — аддымная частка ліцейнай формы, прызначаная для ўтварэння ўнутр. (вонкавых) паверхняў адліўкі.

СТРЫ́ЖАНЬ у біялогіі, цэнтральная частка сцябла або кораня насенных раслін, запоўненая рыхлай парэнхімнай тканкай. Утвараецца са стрыжнёвай мерыстэмы верхавінкі. Звычайна складаецца з танкасценных клетак. Утрымлівае камяністыя клеткі, млечнікі, у хвойных — смаляныя, у складанакветных — эфіраалейныя хады. Унутр. частка С. часам разрываецца і ўтварае адну буйную паветраную поласць (напр., парасонавыя, некат. злакі) або некалькі поласцей (у вінаграду). У многіх раслін С. — месца назапашвання пажыўных рэчываў (напр., у бука — алею і крухмалу, у чайнага куста — дубільных рэчываў).

СТРЫЖАПАДО́БНЫЯ, атрад птушак, гл. *Даўгакрылыя*.

СТРЫЖНЁВАЯ МАШЫ́НА, машына для вырабу ліцейных стрыжняў — састаўных частак *ліцейных формаў*. Рабочы працэс С.м. — ушчыльненне *стрыжнёвых сумесей* у спец. стрыжнёвых скрынках. Адрозніваюць *пескадуўныя машыны*, *пескастрэльныя машыны*, пескамётныя, прэсавыя, устрэсвальныя.

Паводле канструкцыі пескамётныя, прэсавыя і ўстрэсвальныя С.м. падобны да адпаведных *фармовачных машын*. Асн. частка прэсавых С.м. — прэсавы механізм з пнеўма- або гідрапрыводам; устрэсвальных — рабочы стол са скрынкай, які падымаецца пнеўмарухавіком і, падаючы ўніз на станіну, ушчыльняе сумесь у скрынцы. С.м. — адзін з асн. сродкаў *ліцейнай вытворчасці*.

СТРЫЖНЁВАЯ СІСТЭ́МА ў будаўнічай механіцы, геаметрычна нязменная апорная канструкцыя (*рама, ферма* і інш.), што складаецца з жорстка або шарнірна злучаных паміж сабой у вузлах стрыжняў. Адрозніваюць С.с.: плоскія (гл. *Плоская сістэма*) і прасторавыя (гл. *Прасторавая сістэма*); статычна вызначальныя (для іх разліку дастаткова ўраўн. статыкі) і статычна невызначальныя (разлік патрабуе дадатковых ураўн., што характарызуюць дэфармацыі сістэмы). Для стварэння эфектыўных С.с. удасканальваюць метады іх разліку, якія ўлічваюць асаблівасці матэрыялу канструкцый па-за мяжой *пругкасці*.

СТРЫЖНЁВЫЯ СУ́МЕСІ, вогнетрывалыя газапранікальныя і гіграскапічныя сумесі, з якіх на *стрыжнёвых машынах* вырабляюць ліцейныя стрыжні — часткі *ліцейных формаў*.

Складаюцца звычайна з кварцавага пяску, звязвальных рэчываў (напр., карбамідна-фуранавай смалы) і дабавак (графіту і інш.). Бываюць увільготненыя, сухія і вадкія. Ацвярдзенне С.с. у працэсе вырабу стрыжняў адбываецца ў сушыльных печах. Вадкія самаацвярджальныя С.с. пры ўвядзенні ў іх паверхнева-актыўных рэчываў набываюць высокую цякучасць, што дае магчымасць заліваць іх у стрыжнёвыя скрынкі, дзе сумесі цвярдзеюць на паветры без дадатковага ўшчыльнення.



Схема пескадуўнай **стрыжнёвай машыны**: 1 — пнеўматычнае прыстасаванне; 2 — адтуліны (венты); 3 — соплы; 4 — трубаправод; 5 — рэсервуар; 6 — стрыжнёвая скрынка; 7 — стол.

СТРЫ́ЖЫ (Apodes, або Apodi), падатрад птушак атр. даўгакрылых. Вядомы з ніжняга эацэну (каля 85 млн. г. назад). 2 сям.: С. чубатыя (Hemiprocnidae) — 4 віды, пашыраны ад паўд. Індыі да Новай Гвінеі, і ўласна С. (Apodidae) — 18 родаў, 82 віды, пашыраны паўсюдна,



Стрыжы: 1 — малы; 2 — чорны; 3 — чубаты.

акрамя палярных абласцей. У палёце самыя хуткія з птушак (скорасць С. іглахвостых да 300 км/гадз). Гняздуюцца ў расколінах скал, дуплах, пад стрэхамі пабудоў і інш. Ва ўмераных шыротах пералётныя, у тропіках — аселыя. На Беларусі 1 від — С. чорны (Apus apus), нар. назва шкурат.

Даўж. цела да 33 см, маса да 140 г. Апярэнне зверху цёмнае. Дзюба кароткая, шырокая, рот вялікі. Крылы доўгія, вострыя. Ногі кароткія, у большасці відаў усе 4 пальцы накіраваны ўперад, каб зачапляцца кіпцюрамі за выступы гнязда. Кормяцца (насякомымі) і п'юць у палёце. Маюць развітыя слінныя залозы, выдзяленні якіх выкарыстоўваюць пры пабудове гнёзд. Манагамы. Адкладваюць да 6 яец. *Э.Р.Самусенка.*

СТРЫЖЭ́НАЎ Алег Аляксандравіч (н. 10.8.1929, г. Благавешчанск Амурскай вобл., Расія), расійскі акцёр. Нар. арт. СССР (1988). Скончыў Тэатр. вучылішча імя Б.Шчукіна (1953). З 1953 акцёр Рус. т-ра драмы ў Таліне, з 1954—55 — т-ра драмы імя А.Пушкіна ў Ленінградзе, з 1957 — Т-ра-студыі кінаакцёра ў Маскве, у 1966—76 — Маскоўскага Маст. акад. т-ра. Створаныя ім вобразы аб'яднаны высокай адухоўленасцю, паэт. драматызмам, псіхал. дакладнасцю. Зняўся ў фільмах: «Авадзень» (1955), «Сорак першы» (1956), «Капітанская дачка», «Хаджэнне за тры моры» (абодва 1958), «Белыя ночы» (1960), «Непадсудны» (1969), «Зорка чароўнага шчасця» (1975), «Юнацтва Пятра» (1981), «Снайпер» (1992) і інш. Аўтар кн. «Споведзь» (1999).

СТРЫЙ, горад у Львоўскай вобл. Украіны, на р. Стрый. Вядомы з 1385. Каля 80 тыс. ж. (2002). Чыг. вузел. Прам-сць: маш.-буд., металаапр., радыёэлектронная, дрэваапр., лёгкая (тэкст., гарбарна-абутковая, швейная), харч., буд. матэрыялаў. Краязнаўчы музей.

СТРЫЙКО́ЎСКІ (Stryjkowski, Strykowski) Мацей (1547, Стрыкаў Лодзінскага ваяв., Польшча — каля 1590), польскі гісторык, храніст, паэт. Скончыў парафіяльную школу ў Бжазінах (1561). У 1563 пераехаў у ВКЛ. У 1563—73, верагодна, служыў у войску ВКЛ на маскоўскай мяжы ў якасці рыскуна (разведчыка). У 1572—74 служыў у Віцебскім гарнізоне пад камандаваннем А.*Гваньіні* і працаваў над гісторыяй ВКЛ і суседніх дзяржаў. У канцы служ-

бы здзейсніў падарожжа па Зах. Дзвіне, у час якога занатаваў свае назіранні па гісторыі, этнаграфіі і культуры: аб *Рагвалодавым камені*, цэрквах і манастырах Полацка. У 1574—75 удзельнічаў у пасольстве ў Турцыю. У 1576—78 знаходзіўся пры двары кн. Алелькавічаў-Слуцкіх у Капылі і Слуцку. У 1579 заняў духоўную пасаду жамойцкага каноніка. У 1574 выдаў у Кракаве паэму «Ганец цноты...» (кароткая вершаваная гісторыя ВКЛ, частка твора пад назвай «Генеалогія, альбо Кароткае апісанне

вялікіх князёў літоўскіх» выдадзена ў 1626 у *Любчанскай друкарні*. Аўтар гіст. твораў «Аб вольнасці Кароны Польскай і Вялікага княства Літоўскага» (1575), «Аб пачатках, вывадах, мужнасці, справах рыцарскіх і хатніх слаўнага народа літоўскага, жамойцкага і рускага» (выд. ў 1978), «Аб паражэнні 30 000 Масквы з князем Пятром Шуйскім ваяводам полацкім у полі Іванскім над ракой Улай... 1564 года» (не апублікаваны, рукапіс зберагаецца ў Пушкінскім доме ў С.-Пецярбургу). Гал. праца С. — *«Хроніка польская, літоўская, жамойцкая і ўсяе Русі»* (1582) — першая друкаваная гісторыя ВКЛ. Многія даследчыкі лічаць, што твор Гваньіні «Апісанне Еўрапейскай Сарматыі» (1578) з'яўляецца плагіятам запісак С., у чым С. неаднаразова абвінавачваў Гваньіні на старонках сваёй «Хронікі». *А.А.Семянчук.*

«СТРЫКА́Ч», бел. нар. танец. Муз. памер 2/4. Тэмп умераны. Танец вясёлы, жыццярадасны. Выконваўся ў летні час на вечарынках дзяўчатамі пры ўдзеле юнака, якога называлі «стрыкачом». Юнак, нібы нарваўшы крапівы, «стрыкаў» ёю дзяўчат — бегаў за імі прыпяваючы. Танец шырока вядомы на Віцебшчыне. Сцэнічны варыянт створаны ў 1977 балетмайстрам І.Серыкавым. *Л.К.Алексютовіч.*

СТРЫ́МЕР (ад англ. streamer вузкая доўгая стужка) у вылічальнай тэхніцы, адзін з *накапляльнікаў* інфармацыі на магн. стужцы для персанальных ЭВМ ці мікра-ЭВМ; таксама *запамінальнае прыстасаванне* з паслядоўным зваротам. Прызначаны для апаратыўнага запісу, архіўнага захоўвання і рэзервовага капіравання вял. аб'ёмаў важнай інфармацыі (праграм, дакументаў і інш.).

С. адрозніваюцца тыпам картрыджа (касеты), дзе змяшчаецца магн. стужка, даўжынёй і шырынёй магн. стужкі, відам магн. галовак запісу-счытвання, колькасцю дарожак запісу і стандартам *сціскання даных*. Картрыджы бываюць 1- ці 2-бабінныя з аб'ёмам інфармацыі да 100 Гбайт, могуць выкарыстоўвацца і касеты для быт. магнітафонаў (у С. мікра-ЭВМ). Скорасць запісу-счытвання інфармацыі да 300 Мбайт/мін. Да С. могуць далучацца аўтазагрузчыкі ці бібліятэкары картрыджаў (прылады для аўтам. змены картрыджаў), што дазваляе павялічыць аб'ём запісанай інфармацыі да некалькіх тэрабайт. *Л.В.Сільноў, М.П.Савік.*

СТРЫНА́ДКІ, вёска ў Падсвільскім пас. Савеце Глыбоцкага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса. За 16 км на У ад г. Глыбокае, 201 км ад Віцебска, 7 км ад чыг. ст. Падсвілле. 229 ж., 82 двары (2001). Пач. школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

СТРЫ́НГЕР (англ. stringer ад string прывязваць, змацоўваць), падоўжны элемент канструкцыі корпуса (каркаса) судна, лятальнага апарата, вагона і інш. Уяўляе сабой ліставую ці таўровую бэльку, сценка якой перпендыкулярная да абшыўкі корпуса. Абшыўка мацуецца да С. і папярочных элементаў (бімсаў, шпангоўтаў) з *набору* корпуса судна.

СТРЫ́НДБЕРГ (Strindberg) Юхан Аўгуст (22.1.1849, Стакгольм — 14.5.1912), шведскі пісьменнік, гісторык, этнограф. Вывучаў філасофію ва ун-це г. Упсала, працаваў настаўнікам, журналістам, акцёрам, бібліятэкарам. У 1860—70-я г. зазнаў уплыў экзістэнцыялісцкай філасофіі С.*К'еркегора*, пазітывісцкай гіста-



А.**Стрындберг**.

рыяграфіі Х.Т.Букле і натуралістычных твораў Г.Брандэса. У 1883—98 у эміграцыі. У першых творах — драме «Вальнадумец» (1870), трагедыях «Герміёна» (1871) і «Адрынуты» (1876) ідэя прагрэсіўнага пастаўлення асобы асяроддзю; у гіст. драмах «Местэр Улуф» (1872), «Сакрэт гільдыі» (1880) і інш. праблема ўзаемаадносін простага чалавека і бязлітаснай цывілізацыі. Маст.-псіхал. аналіз прадстаўнікоў творчых і дзелавых колаў Стакгольма ў рамане «Чырвоны пакой» (1879). У зб. натуралістычна-рэаліст. навел «Лёсы і прыгоды шведаў» (т. 1—4, 1882—92), этнагр. працы «Шведскі народ» (т. 1—2, 1882) тэма народа як творцы гісторыі. Палеміка з тагачаснымі сац. утопіямі ў зб-ках навел і памфлетаў «Новая імперыя» (1882), «Утопіі і рэчаіснасць» (1885), зб. «Вершы» (1883). Зб. прозы «Шлюбныя гісторыі» (ч. 1—2, 1884—86) уласціва антыфемінісцкая скіраванасць. У раманах «Людзі з вострава Хемсё» (1887), «На ўзбярэжжы» (1890), п'есах «Бацька» (1887), «Фрэкен Жулі» (1888) і інш. натуралістычныя тэндэнцыі; у аўтабіягр. кнігах «Сын пакаёўкі» (1886), «Споведзь вар'ята» (1888), «Пекла» (1897), «Легенды» (1898), гіст. драмах «Густаў Ваза», «Эрык XIV» (абедзве 1899), «Карл XII» (1901), «Крысціна» (1903) і інш. праблемы маральна-псіхал. выбару. Новы этап у творчасці С. адзначаны сімвалісцкамістычнымі драм. творамі: трылогія «Шлях у Дамаск» (ч. 1—3, 1898—1904), «Адвент» (1899), «Танец смерці» (1901) і інш. Гэту традыцыю прадоўжыў у п'есах «Навальніца», «Саната прывідаў», «Пелікан» (усе 1907), «Вялікі гасцінец» (1909), напісаных для заснаванага разам з рэж. А.Фалькам у 1907 стакгольмскага Інтымнага т-ра. Для раманаў «Самотны» (1903), «Гатычныя пакоі» (1904), «Чорныя сцягі» (1907) характэрны сац.-крытычныя матывы. Аўтар дзённікаў «Блакітная кніга» (т. 1—4, 1907—12), гіст. мініяцюр, дарожных нататак, публіцыст. і літ.-знаўчых прац. На бел. мову асобныя навелы С. пераклаў В.Буйвал. Брэсцкі т-р драмы і музыкі паводле яго п'есы «Фрэкен Жулі» паст. «Начную санату для мужчыны, жанчыны і троля» (1993).

Тв.: Бел. пер. — [Навелы] // Крыніца. 1999. № 1; Рус. пер. — Полн. собр. соч. Т. 1—15. М., 1908—12; Избр. произв. Т. 1—2. М., 1986.

Літ.: Август Стриндберг: Биобиблиогр. указ. М., 1981. *Л.П.Баршчэўскі.*

СТРЫПТЫ́З (ад англ. strip распранацца + tease дражніць), музычна-танцавальнае прадстаўленне, удзельніцы (або ўдзельнікі) якога паступова агаляюцца пад музыку. Звычайна выконваецца ў спец. рэстаранах, начных барах.

СТРЭ́ЖАЎ, старажытны горад Полацкай зямлі. Упершыню ўпамінаецца ў летапісах пад 1127—28 у сувязі з паходамі кааліцыі паўд.-рус. князёў на Полацкую зямлю «... а Всеволоду Олговичю проведе ити с своею братею на Стрежев к Борисову». Іпацьеўскі летапіс называе гэты горад яшчэ раз пад 1159: «Рогволод ... а Всеволоду да Стрежев». Аднак С. пакуль не лакалізаваны. Адны даследчыкі атаясамлівалі яго з в. Стрыжава Бешанковіцкага р-на. Аднак рэшткі ўмацаванага паселішча часоў Кіеўскай Русі тут не выяўлены. Другія шукалі С. на месцы сучаснага г.п. Стрэшын Жлобінскага р-на. У ім даследаваны 2 археал. помнікі 12 ст. Але гэты населены пункт размешчаны далёка ад паўд. мяжы Полацкай зямлі, што ставіць пад сумненне існаванне тут летапіснага С. *Г.М.Семянчук.*

СТРЭ́ЛЕР (Strehler) Джорджа (14.8.1921, г. Трыест, Італія — 25.12.1997), італьянскі рэжысёр. Скончыў Акадэмію аматараў драм. мастацтва ў Мілане (1940). У 1947—68, з 1972 арганізатар і кіраўнік (сумесна з П.Грасі) 1-га ў Італіі стацыянарнага драм. т-ра «Пікала-тэатр» (Мілан), у 1968—72 кіраўнік уласнай тэатр. трупы. Адрадзіў прыёмы італьян. камедыі дэль артэ, працягваў сцэн. традыцыі Б.*Брэхта*. Сярод пастановак: «Слуга двух гаспадароў» (1947) і «Кампъела» (1975) К.Гальдоні, «Вішнёвы сад» А.Чэхава (1955), «Трохграшовая опера» (1956), «Добры чалавек з Сезуана» (1958) і «Швейк у другой сусветнай вайне» (1961) Брэхта, «Кароль Лір» У.Шэкспіра (1972), «Вялікая магія» Э.Дэ Філіпа (1989), «Востраў рабоў» П.Марыво (1995) і інш.

СТРЭ́ЛКА ў геамарфалогіі, вузкая намыўная паласа сушы, накіраваная ў бок мора; доўгая каса з пяску, ракушачніку, жвіру (напр., Арабацкая С. ў Крыме). С. наз. таксама ўчастак сушы ў выглядзе вострага кліна паміж 2 рэк у іх сутоках ці заканчэнне вострава паміж пратокамі, што яго абцякаюць.

СТРЭЛКАЛІ́СТ (Sagittaria), род кветкавых раслін сям. шальнікавых. Каля 20 відаў. Пашыраны ў Амерыцы і Еўразіі. У Японіі і Кітаі культывуецца С. трохлісты (S. trifolia). На Беларусі 1 від — С. звычайны, або стрэлкалісты (S. sagittifolia).

Трапляецца на балотах, забалочаных лугах, уздоўж берагоў рэк, азёр, часта ўтварае зараснікі.

Шматгадовыя водныя або балотныя травяністыя расліны выш. 30—100 см. Лісце ў прыкаранёвай разетцы: падводнае — стужкападобнае, тое, што плавае — доўгачаранковае, яйцападобнае; надводнае — са стрэлкападобнай пласцінкай. Аднаполыя кветкі белыя, у гронкавых суквеццях. Плод — шматарэшак. Клубні маюць да 50% крухмалу, 8% цукру, ядомыя. Харч., кармавыя, часам дэкар. расліны. *А.М.Скуратовіч.*



Стрэлкаліст звычайны.

СТРЭ́ЛКІ (Capsella), род кветкавых раслін сям. крыжакветных. 5 відаў. Пашыраны ва ўмераных і субтрапічных паясах. На Беларусі 1 від — С. звычайныя (C. bursa-pastoris). Трапляюцца на пустках, як пустазелле на палях, у садах, каля дарог.



Стрэлкі звычайныя.

Адна- ці двухгадовыя травяністыя расліны. Сцёблы простыя або галінастыя. Ніжняе лісце ў разетцы, перыстараздзельнае, сцябловае — сядзячае, суцэльнае. Кветкі дробныя, белыя або ружаватыя, у гронках. Плод — стручочак. С. звычайныя маюць лек. ўласцівасці, у насенні ёсць алей. Лек., кармавыя расліны. *А.М.Скуратовіч.*

СТРЭ́ЛЬБА, ручная *агнястрэльная зброя* з доўгім ствалом. Да С. адносяць агнястрэльныя *ружжы* з ненаразным ствалом і наразныя *вінтоўкі*, у т.л. аўтаматычныя (гл. *Аўтаматычная зброя*). Гл. таксама *Зброя, Стралковая зброя.*

СТРЭ́ЛЬБІШЧА, спецыяльна абсталяваны ўчастак для правядзення стрэльбаў са *стралковай зброі*, *гранатамётаў* і інш. Падзяляюцца на вайсковыя і спартыўныя. Тэрыторыя вайсковага С. ўключае рубяжы адкрыцця і спынення агню, мішэннае поле, тылавы раён, пункты кіравання, выдачы боепрыпасаў і інш. На С. можа быць *цір* для праверкі зброі, прывядзення яе да нармальнага бою і інш. Спартыўнае С. — спец. збудаванне адкрытага тыпу для стральбы з *вінтовак* і *пісталетаў*. Складаецца з некалькіх ціраў, дзе вызначаны лініі агню (месца, з якога вядуць стральбу) і лініі мішэняў, абсталяванай бліндажамі, пад'ёмнымі ўстаноўкамі, механізмамі для кіравання і інш.

С.А.Фамін, І.А.Шор.

СТРЭ́ЛЬНІКАЎ Віктар Пятровіч (н. 22.10.1932, с. Казлоўка Цярноўскага р-на Варонежскай вобл., Расія), бел. вучоны ў галіне анатоміі. Д-р мед. н. (1969), праф. (1972). Засл. работнік вышэйшай школы Беларусі (1987). Скончыў Варонежскі мед. ін-т (1956). З 1972 у Бел. акадэміі фіз. культуры (заг. кафедры, у 1977—78 дэкан, у 1980—85 прарэктар). Навук. працы па пытаннях нармальнай анатоміі чалавека.

СТРЭ́ЛЬСКАЯ (па мужу Стукалкіна) Варвара Васілеўна (16.12.1838, Масква — 24.1.1915), руская актрыса. Вучылася ў Пецярбургскім тэатр. вучылішчы. З 1857 актрыса Александрынскага т-ра ў Пецярбургу. Выконвала ролі дзяўчат у камедыях і вадэвілях, напр., Ліза («Гора ад розуму» А.Грыбаедава). Росквіт камед. даравання звязаны з пераходам С. на характарныя ролі сталых жанчын. Для творчай манеры характэрны арганічнасць пераўвасаблення, абаяльнасць, багацце сцэн. мовы. Сярод лепшых роляў: Домна Панцялеўна, Кукушкіна, Мігачова («Таленты і паклоннікі», «Даходнае месца», «Не было ні гроша, ды раптам шастак» А.Астроўскага), Пашлёпкіна, Фёкла Іванаўна («Рэвізор», «Жаніцьба» М.Гогаля), Прастакова («Недаростак» Дз.Фанвізіна).

СТРЭ́ЛЬСКІ, ландшафтны заказнік рэсп. значэння на тэр. Мазырскага і Калінкавіцкага р-наў Гомельскай вобл. Засн. ў 1999 для аховы унікальных прыродных тэрыторый, дзе прадстаўлены амаль усе ландшафтныя комплексы Бел. Палесся. Пл. 12161 га. Ландшафты ўзгорыста-марэнна-эразійныя з покрывам водналедавіковых супескаў, другасных водна-ледавіковых слаба дрэніраваных раўнін, сучаснай поймы р. Прыпяць і лагчын яе прытокаў. Перапады вышынь да 40 м. Прыроднае расл. покрыва — 80%, пераважаюць хваёвыя лясы, шмат дуброў, сустракаюцца чорнаалешнікі і ясеннікі крапіўныя. У пойме Прыпяці пашыраны злакавыя гідрамезафітныя і астэпаваныя лугі. У флоры больш за 500 відаў сасудзістых і 250 відаў ніжэйшых раслін, з іх 27 відаў занесены ў Чырв. кнігу: венерын чаравічак сапраўдны, кураслеп лясны, воўчнік баравы, дрок германскі, кадзіла сармацкае, касач сібірскі, шпажнік чарапіцавы, сальвінія плывучая і інш. Фауна пазваночных уключае 264 віды, з іх 20 у Чырв. кнізе: вусач, сцерлядзь, чарапаха балотная, рапуха чаротная, паганка малая, каршачок, шулёнак, пустальга звычайная, кулік-сарока, уліт вялікі, соні арэшнікавая і садовая, барсук, малая вячэрніца і інш. *П.І.Лабанок.*

СТРЭ́МЯ, прыстасаванне для ўпору і падтрымкі ног конніка. Прататыпы С. са скуры, вяроўкі і інш. матэрыялаў з'явіліся ў 3—4 ст. З 4—5 ст. ва Усх. Азіі выкарыстоўвалі драўляныя канструкцыі С., якія праз цюркаў трапілі ў Еўропу, адкуль іх, верагодна, запазычылі славяне. У Кітаі ў 3 ст. пачалі адліваць метал. С. дасканалай формы. У слав. старажытнасцях найб. раннімі лічацца жал. С. 9 ст. З 10 ст. іх шырока выкарыстоўвалі на ўсёй тэр. Беларусі. Сярэдневяковыя С. формай дужак і падножак, памерамі адтуліны для путлішча падзяляліся на кольцападобныя і авальныя; з 12 ст. пашыраны арачныя формы з простай падножкай, якімі карысталіся цяжкаўзброеныя дружыннікі. У 14—15 ст. вядомы трапецападобныя С. рыцарскага тыпу. З пераходам у 16 ст. на цвёрдаабцасавы абутак круглаватыя канструкцыі выйшлі з ужытку. У 17 ст. на Беларусі былі папулярныя турэцкія арнаментаваныя С. з шырокай падножкай, часам на даўжыню падэшвы. Раннесярэдневяковыя С. знойдзены ў Браславе, Навагрудку, Брэсце, на гарадзішчы *Маскавічы*, у Мінску, больш познія — у Віцебску, Дрысвятах, Крычаве, Мсціславе, Гродне і інш.

Г.М.Сагановіч.

СТРЭ́ПЕТАВА Паліна (Пелагея) Анціпаўна (4.10.1850, г. Ніжні Ноўгарад, Расія — 17.10.1903), руская актрыса. Жонка М.І.*Пісарава*. Выступала ў правінцыі ў камедыях, вадэвілях, драмах, аперэтах. З 2-й пал. 1870-х г. актрыса Агульнадаступнага т-ра ў Маскве, у 1881—90, 1899—1900 — Александрынскага т-ра ў Пецярбургу. Валодала выдатным трагедыйным дараваннем і тэмпераментам. Сярод лепшых роляў: Ліза-

вета («Горкая доля» А.Пісемскага), Кацярына, Мар'яна Андрэеўна, Кручыніна («Навальніца», «Бедная нявеста», «Без віны вінаватыя» А.Астроўскага), Сцепаніда («Каля грошай» В.Крылова паводле рамана А.Пацехіна), Сара («Іванаў» А.Чэхава), Мар'іца («Кашырская даўніна» Дз.Аверкіева) і інш.

Тв.: Воспоминания и письма. М.; Л., 1934.

Літ.: Беньяш Р.М. П.А.Стрепетова. Л., 1967.



П.А.**Стрэпетава**.

СТРЭПТАКО́КІ (Streptococcus), род бактэрый сям. стрэптакокавых. Каля 20 відаў. Трапляюцца ў глебе, на раслінах, скуры жывёл і чалавека. Сапрафітныя, умоўна патагенныя і патагенныя віды.

Клеткі нерухомыя, шарападобныя, размешчаныя ланцужкамі або парамі. Грамстаноўчыя. Факультатыўныя анаэробы, хемааргана-гетэратрофы. Спор не ўтвараюць. Патагенныя С. выдзяляюць экза- і эндатаксіны, з'яўляюцца ўзбуджальнікамі сепсісу, гнойных запаленняў, ангіны, пнеўманіі, рэўматызму і інш. хвароб. Энтэракок (S. faecalis) жыве ў страўніку жывёл і чалавека, індыкатар фекальнага забруджвання. Некат. віды збраджваюць глюкозу ў малочную к-ту, выкарыстоўваюцца ў малочнай і харч. прам-сці.

А.І.Ерашоў.

СТРЭС, сукупнасць рэакцый жывога арганізма на дзеянне надзвычайных раздражняльнікаў, тое, што *адаптацыйны сіндром*.

СТРЭ́СНЕР (Stroessner) Альфрэда (н. 3.11.1912, г. Энкарнасьён, Парагвай), дзяржаўны і ваен. дзеяч Парагвая. Брыгадны генерал (1948). З 1952 галоўнакамандуючы ўзбр. сіламі краіны. У 1954 скінуў прэзідэнта Ф.Чавеса і пры падтрымцы арміі ўсталяваў дыктатуру; у 1954—89 прэзідэнт Парагвая. Абапіраўся на ваен. вярхі і правакансерватыўную партыю «Каларада» (засн. ў 1874). У час яго дыктатуры загінула больш за 12 тыс. чал. У лют. 1989 скінуты ген. А.Радрыгесам, уцёк з краіны. Эмігрыраваў ў Бразілію.

СТРЭ́ЧНА, возера ў Міёрскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Дзісна, за 34 км на ПдУ ад г. Міёры. Пл. 0,52 км^2, даўж. 1 км, найб. шыр. 830 м, найб. глыб. 3,2 м, даўж. берагавой лініі 3,2 км, пл. вадазбору 2,19 км^2. Катлавіна рэшткавага тыпу, размешчана на верхавым балоце Стрэчна. Схілы невыразныя. Берагі выш. 0,4—0,5 м, тарфяныя, параслі асакой. Дно тарфяністае. У цэнтры і залівах асобныя экзэмпляры гарлачыка жоўтага. Сцёк па меліярац. канаве.

СТРЭ́ШЫН, гарадскі пасёлак у Жлобінскім р-не Гомельскай вобл., на правым беразе р. Дняпро. Аўтадарогамі злучаны са Жлобінам, Рэчыцай, Светлагорскам. За 21 км на Пд ад Жлобіна, 105 км ад Гомеля. 1,3 тыс. ж. (2001).

Археал. матэрыялы сведчаць, што С. узнік у 12 ст. як феад. замак (гл. *Стрэшынскі замак*). Побач з замкам выраслa неўмацаванае паселішча. Некат. даследчыкі атаясамліваюць С. са стараж. горадам *Стрэжаў*, які ўпамінаецца ў Лаўрэнцьеўскім і Іпацьеўскім летапісах пад 1127/28 і 1159. С. упамінаецца ў «Спісе рускіх гарадоў далёкіх і блізкіх» (канец 14 ст.). У 1399 С. падараваны вял. кн. ВКЛ Вітаўтам Віленскаму капітулу. У 16—17 ст. горад неаднойчы разбураны. Паводле падымнага рэестра Стрэшынскай вол. 1608, горад падзяляўся на 2 часткі: асн. тэрыторыю (каля замка, мела 56 дамоў) і прадмесце Слабада (46 дамоў); меў 2 ганчарныя майстэрні, рудню, вадзяны млын на р. Стрэшынка. Інвентар 1628 апісвае замак, сядзібу, касцёл і царкву са званіцай; С. — мястэчка, меў 100 двароў, паромную пераправу на Дняпры каля замка. У 1700 каля мястэчка заснавана паташная буда. Пасля 2-га падзелу Рэчы Паспалітай (1793) С. у складзе Рас. імперыі, цэнтр воласці Рагачоўскага пав., мястэчка, уладанне графа Остэрмана. У 1807 пабудавана Пакроўская царква. У канцы 19 ст. ў С. каля 2 тыс. ж., 184 двары, лясны промысел і дробны гандаль, пач. школа. У 1924—27 і 1939—55 цэнтр *Стрэшынскага раёна*, у 1927—39 і з 1956 у Жлобінскім р-не Гомельскай вобл., з 1938 гар. пасёлак. У Вял. Айч. вайну са жн. 1941 да 29.11.1943 акупіраваны ням. фашыстамі, якія загубілі ў С. і раёне 1965 чал.

Працуюць цагельны з-д, камбінат быт. абслугоўвання, лясніцтва, сярэдняя школа, дзіцячы сад, Дом культуры, б-ка, Цэнтр сац.-псіхалагічнай рэабілітацыі насельніцтва, якое пацярпела ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС (праграма ЮНЕСКА), бальніца, паліклініка, аптэка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Помнік архітэктуры — *Стрэшынская царква*. На паўд.-ўсх. ускраіне гарадзішча (12 ст.).

СТРЭ́ШЫНА-МО́РМАЛЬСКАЯ ГРУ́ПА БАЛО́Т, нізінныя балоты на Пд Жлобінскага р-на Гомельскай вобл., у міжрэччы рэк Дняпро і Бярэзіна. Уключае 15 балотных масіваў, якія прымыкаюць адзін да аднаго. Агульная пл. 7,1 тыс. га, у межах прамысл. пакладу 5,8 тыс. га. Глыб. торфу да 9,3 м, сярэдняя — 2,6 м. Запасы торфу каля 27 млн. т. (здабываюць на паліва і на ўгнаенне). Частка выпрацаваных тэрыторый рэкультывавана. Астатняя тэр. асушана пераважна дрэнажом, выкарыстоўваецца пад ворыва і сенажаць.

СТРЭ́ШЫНСКАЯ ЦАРКВА́, помнік архітэктуры класіцызму ў г.п. Стрэшын Жлобінскага р-на Гомельскай вобл. Пабудавана ў 1807 з цэглы. Храм цэнтрычны, складаецца з асн. аб'ёму (у плане квадрат са зрэзанымі вугламі) і прылеглых да яго з 4 бакоў паўкруглых аб'ёмаў. Асн. аб'ём мае сферычнае пакрыццё, завершаны круглым светлавым барабанам-ратондай з невял. купалам. Аналагічныя вежачкі-ратонды пазначаюць вуглы аб'ёму, грані якога завершаны трохвугольнымі франтонамі. Фасады аздоблены пілястрамі і паўцыркульнымі нішамі, у якіх размешчаны аконныя праёмы. У стварэнні арх. рытму фасадаў выкарыстаны авальныя, круглыя і паўкруглыя люкарны. Тры ўваходы вылучаны высокімі мураванымі ганкамі. Пад будынкам зроблена крыпта, у якую вядуць 2 лесвіцы, размешчаныя ў тоўшчы сцяны. У 1989 храм рэстаўрыраваны (арх. В.Калнін).

А.А.Міцянін.



Стрэшынская царква.

СТРЭ́ШЫНСКІ ЗА́МАК. Існаваў у 12—18 ст. у г.п. *Стрэшын* Жлобінскага р-на Гомельскай вобл. Быў пабудаваны з дрэва на абкружаным ровам мысе Дняпра. У сістэму ўмацаванняў замка ўваходзілі 5 вежаў, роў, вал, гародні. Сярод узбраення С.з. былі гарматы, мушкеты, гакаўніцы, жал. і алавяныя ядры, гакаўнічныя і мушкетныя кулі і інш. У антыфеад. вайну 1648—51 і вайну Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—67 замак знаходзіўся ў цэнтры ваен. падзей. У ліп. 1654 казакі І.Залатарэнкі ўзялі Стрэшын штурмам, а замак спалілі. Пасля вайны С.з. быў адноўлены, аднак ранейшай магутнасці ўжо не меў і ў такім стане праіснаваў да 1793.

СТРЭ́ШЫНСКІ РАЁН, адм.-тэр. адзінка ў БССР у 1924—27 і ў 1939—56. Цэнтр — г.п. *Стрэшын*. Утвораны 17.7.1924 у Бабруйскай акр., 20.8.1924 падзелены на 7 сельсаветаў. 4.8.1927 раён скасаваны, тэрыторыя далучана да Жлобінскага р-на. Адноўлены 28.6.1939 у Гомельскай вобл. ў складзе 10 сельсаветаў. 17.12.1956 раён скасаваны, тэрыторыя перададзена ў Жлобінскі р-н.

СТУ́АКА-ГУЦЯ́ВІЧУС (Stuoka-Gucevičieus) Лаўрынас, Гуцэвіч (Gucewicz) Ваўжынец (5.8.1753, с. Міганяй Панявежскага пав., Літва — 21.12.1798), літоўскі архітэктар; прадстаўнік класіцызму. Вучыўся ў Віленскім ун-це (1773—75, вучань М.*Кнакфуса*), Рыме (1776—77), Парыжскай каралеўскай акадэміі (1778) у арх. Ж.Ж.*Суфло*, К.Н.*Леду* і арх. школе Ж.Ф.*Бландэля*. Выкладаў у

Школе літ. інж. корпуса ў Вільні (1789—94) і Віленскім ун-це (1795—98); праф (з 1793). Удзельнік паўстання Т.Касцюшкі (1794). Асн. работы: у Вільні — кафедральны сабор св. Станіслава (1777—1801, будаваў арх. М.Шульц; у аснове гатычны сабор 15 ст.), палац епіскапа (1792, перабудаваны ў 19 ст. паводле праекта В.П.Стасава), рэканструкцыя палацава-паркавага ансамбля Масальскіх у Веркяй (пачата Кнакфусам; завершана ў 1810), праект рэканструкцыі і буд-ва ратушы (1781—



Л.**Стуака-Гуцявічус**. Касцёл у в. Маляцічы Крычаўскага раёна Магілёўскай вобл. Фота пач. 20 ст.

99, завершана Шульцам); рэканструкцыя замка 16 ст. ў Раўдоне (Юрбаркскі пав., канец 18 ст.). У 1780 стварыў тапаграфічны план Вільні. На Беларусі паводле праектаў С.-Г. на заказ Магілёўскага архіепіскапа С.Богуш-Сестранцэвіча пабудаваны касцёл (1787—94, не захаваўся) і сядзібны комплекс у в. Маляцічы Крычаўскага р-на Магілёўскай вобл. (буд-вам кіраваў яго вучань Я.Падчашынскі). Касцёл уяўляў сабой паменшаную копію сабора св. Пятра ў Рыме. Аўтар праекта ратушы ў г.п. Відзы Віцебскай вобл. (1795, не захавалася), многіх незахаваных палацавых комплексаў для магнатаў і шляхты. Творчасць С.-Г. істотна паўплывала на літ., польск. і бел. архітэктараў перыяду класіцызму. *В.Ф.Марозаў.*

СТУ́БЛА, балота пераважна нізіннага тыпу ў Івацэвіцкім, Бярозаўскім і Пружанскім р-нах Брэсцкай вобл., у вадазборы р. Жыгулянка. Пл. 7,8 тыс. га, у межах прамысл. пакладу 4,8 тыс. га. Глыб. торфу да 3,8 м, сярэдняя — 1,6 м. Запасы торфу каля 14 млн. т. Балота часткова асушана, выкарыстоўваецца пад сенажаць. На неасушанай тэр. мяшаны лес, травяное покрыва пераважна з асакі.

СТУДЗЕНАВО́ДСКІ ШКЛОЗАВО́Д. Дзейнічаў у 1805—26 у в. Студзёная Вада каля г. Гомель (цяпер у межах горада). Вырабляў хрустальны і шкляны посуд, багемскае і аконнае шкло, слоікі, лямпы, конаўкі, бутэлькі, у т.л. для шампанскага. Меў 3 печы, да 32 горнаў для плаўкі шкла. Працавала ў розныя гады ад 33 да 72 чалавек. У 1826 выраблена 4,7 тыс. бутэлек, слоікаў і інш., 9,7 тыс. лістоў аконнага і багемскага шкла, 400 тыс. шампанскіх бутэлек.

СТУ́ДЗЕНЬ (назва ад слова «сцюжа»), першы месяц каляндарнага года (31 дзень), самы халодны на Беларусі. 15 °С. даўж. дня ў Мінску 7 гадз 56 мін, выш. Сонца над гарызонтам у поўдзень 14,8°. Сярэдняя сума сонечнай радыяцыі за месяц 69 МДж/м^2, радыяцыйны баланс адмоўны (-22 МДж/м^2). Сярэдняя т-ра паветра ад -4,5 °С на ПдЗ да -7,9°С на ПнУ Беларусі. Адносная вільготнасць паветра 86—90%, колькасць вільготных дзён 19—25, ападкаў 25—35 мм за месяц. У С. з адлігай 8—11 дзён на Пн і 11—15 дзён на ПдЗ. Глеба прамярзае на 30—50 см. Рэкі і азёры скаваны лёдам, паўсюднае снегавое покрыва. У С. пачынаецца гон у ваўкоў. Мядзведзі, барсукі, янотападобныя сабакі, вожыкі, кажаны ў зімовай спячцы. З тундры прылятаюць белая сава, пуначка, касматаногі канюк. У канцы С. пачынаюць віць гнёзды крыжадзюбы — адзіныя з птушак, што гняздуюцца зімой. У пошуках корму да чалавечага жылля прылятаюць амялушкі, гіль, чачотка, шчыгол, чыж, аўсянка.

СТУДЗЁНКА, вёска ў Прыгарадным с/с Барысаўскага р-на Мінскай вобл., на левым беразе р. Бярэзіна. За 15 км на ПнЗ ад горада і 20 км ад чыг. ст. Барысаў, 90 км ад Мінска. 58 ж., 37 двароў (2001). Брацкая магіла сав. воінаў. Помнікі (1962 і 1965) рус. воінам 1812.

У вайну 1812 каля С. 26—28 ліст. адбылася пераправа цераз Бярэзіну рэшткаў франц. арміі Напалеона, якая адступала з Масквы. У гэты час рус. армія П.В.Чычагова (30 тыс. чал.) стаяла на правым беразе ракі, армія П.Х.Вітгенштэйна (каля 30 тыс. чал.) падыходзіла да Барысава з Пн, казацкія войскі М.І.Платава і авангард гал. сіл рус. арміі М.І.Кутузава праследавалі французаў з У. Дэманстрацыя актыўнасці франц. войск каля Барысава спрыяла дэзінфармацыі рус. камандавання, якое лічыла больш верагодным адступленне Напалеона на Мінск і Слонім. У выніку адпаведных загадаў Чычагоў 25—26 ліст. перавёў амаль усе свае войскі з-пад Барысава на Пд. 26 ліст. па наведзеных мастах пачалася пераправа франц. войск, якія захапілі плацдарм на правым беразе Бярэзіны і адначасова забяспечылі прыкрыццё гасцінца Барысаў—Студзёнка. На працягу 3 дзён на правы бераг пераправілася большасць баяздольных франц. карпусоў, у т.л. 27 ліст. сам Напалеон з гвардыяй. На левым беразе французы ўтрымлівалі ўсе подступы да мастоў, пакуль працягвалася пераправа. Раніцай 29 ліст. масты былі спалены, і армія Напалеона рушыла ў напрамку Маладзечна. У выніку баёў каля С. французы здолелі ўтрымаць пазіцыі на абодвух берагах і забяспечыць пераправу цераз Бярэзіну, аднак Напалеон страціў каля 25 тыс. чал. і абоз. Гл. таксама *Бярэзінская аперацыя 1812.*

СТУДЗЁНКА, вёска ў Сенненскім р-не Віцебскай вобл., на паўд. беразе воз. Бярозаўскае, каля аўтадарогі Сянно — Багушэўск. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 12 км на У ад г. Сянно, 50 км ад Віцебска, 25 км ад чыг. ст. Багушэўская. 165 ж., 50 двароў (2001). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі.

СТУДЗЁНКАЎСКАЕ ВАДАСХО́ВІШЧА. У Быхаўскім р-не Магілёўскай вобл., за 1,5 км на ПнУ ад в. Студзёнка. Створана ў 1980 на пойме р. Грэза (35 км ад вусця). Пл. 0,32 км^2, даўж. 900 м, найб. шыр. 550 м, найб. глыб. 7,5 м, аб'ём вады 1 млн. м^3. Сярэдні шматгадовы сцёк 12,6 млн. м^3. Даўж. агараджальнай дамбы 1,4 км. Наліўное. Напаўняецца вадой з р. Грэза па водападводным канале даўж. 500 м. Ваганні ўзроўню вады на працягу года да 3 м. Выкарыстоўваецца для арашэння с.-г. угоддзяў, гасп.-быт. і проціпажарных мэт.

СТУ́ДЗІНА, традыцыйная мясная страва ў многіх народаў. У беларусаў лакальныя назвы квашаніна, квашэліна, халадзец, дрыгва, ляк, юха і інш. Вараць звычайна са свініны (памытыя і пасечаныя на кавалкі ногі, часткі галавы, вушы, хвост). Часам дадаюць яловічыну, птушку. Кладуць моркву, цыбулю, прыправы. Вараць доўга, каб мяса ўпарылася і адстала ад касцей. Потым косці выбіраюць, мяса рэжуць, пасыпаюць дробна накрышаным сырым часнаком. Заліваюць булёнам (юшкай), разліваюць у міскі або талеркі і ставяць у халоднае месца, каб застыла. *Г.Ф.Вешарт.*

СТУДЗЯНЕ́Ц, помнік прыроды рэсп. значэння (з 1968), геалагічнае агаленне старажытных азёрных адкладаў. Размешчана за 1,7 км на ПнЗ ад в. Занарач Мядзельскага р-на Мінскай вобл., ва ўрочышчы Студзянец. Прымеркавана да ўступа азёрнай тэрасы паўд.-зах. берага воз. Нарач. Праслоі намыўнога торфу ў выглядзе лінз і невял. слаёў, якія належаць да паазерскіх (аляродскіх і познадрыясавых) азёрных утварэнняў, залягаюць у тоўшчы (да 6 м) пяскоў. У адкладах торфу вылучана эталонная аляродская флора ляснога тыпу (хвоя, елка, ляшчына, вярба і інш.). С. — першае датаванае агаленне аляроду і дрыясу на тэр. СССР (абсалютны ўзрост хвоі каля 10810 гадоў). Побач выяўлены крамянёвыя пласціны, скрэблы, вастрыё і інш. прылады працы стараж. чалавека ў верхнім палеаліце і раннім мезаліце. *В.Ф.Вінакураў.*

СТУДЗЯНЕ́Ц, С ц ю д з я н е ц, вёска ў Беладуброўскім с/с Касцюковіцкага р-на Магілёўскай вобл. За 5 км на Пд ад горада і чыг. ст. Касцюковічы, 165 км ад Магілёва. 242 ж., 115 двароў (2002). Пач. школа, б-ка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў. Радзіма П.М.*Лепяшынскага.*

Вядома з пач. 18 ст. як мястэчка ў Крычаўскім старостве Мсціслаўскага ваяв. ВКЛ. У 1744 у С. школа, царква. З 1772 у Рас. імперыі, 62 ж., 15 двароў; у 1799 — 168 ж., 42 двары, побач размяшчалася Студзянецкая Гута. У 19 ст. мястэчка ў Чэрыкаўскім пав. Ма-

гілёўскай губ., уладанне Свінвінавых. У 1846 у С. дзягцярнае смаляное прадпрыемства, паташны з-д, 2 сукнавальні, 3 вінакурні, 7 вадзяных і валовы млыны, 2 заезныя дамы. У фальварку былі маслабойня (1850), нар. вучылішча (1864), канатна-льнотрапальнае прадпрыемства (1879), бальніца для сялян. У 1880 С. — уладанне Цярэшчанкі, 1571 ж., 130 двароў, валасное праўленне, 2 царквы, 2 кірмашы на год; у 1909 — 1531 ж., 203 двары, нар. вучылішча, прыёмны пакой. З 20.8.1924 вёска, цэнтр сельсавета Касцюковіцкага р-на Калінінскай, з 1927 — Магілёўскай акр.

В.В.Віталёва.



Студзянецкі валун каля в. Равы Ашмянскага раёна Гродзенскай вобласці.

СТУДЗЯНЕ́ЦКІ ВАЛУ́Н, геалагічны помнік прыроды рэсп. значэння (з 1994). Размешчаны за 2 км на У ад в. Равы Ашмянскага р-на Гродзенскай вобл. Назва ад б. хутара Студзянец. Ружова-чырвоны граніт рапаківі з крышталямі палявога шпату (авоіды 2—5 см). Даўж. 3,8 м, шыр. 2,4 м, выш. 1,2 м, у абводзе 10 м, аб'ём 10,9 м^3, маса 29 т. Прынесены ледавіком каля 150 тыс. гадоў назад з Пдз Фінляндыі. Валун падобны на прас.

В.Ф.Вінакураў.

СТУДЗЯНІ́, структураваныя (цвёрдападобныя) сістэмы палімер—растваральнік. Характарызуюцца значнымі абарачальнымі *дэфармацыямі* пры практычна поўнай адсутнасці цякучасці, што абумоўлена наяўнасцю ў С. прасторавай сеткі макрамалекул, злучаных у асобных «вузлах» хім. сувязямі рознай прыроды або сіламі міжмалекулярнага ўзаемадзеяння (гл. *Гелі*).

С. ўтвараюцца пры набраканні сеткавых палімераў у вадкім асяроддзі (С. I тыпу) ці з растворaў палімераў пры змяненні іх т-ры і саставу (С. II тыпу). У С. тыпу I «вузлы» прасторавай сеткі ўтворaны моцнымі папярочнымі хім. сувязямі, іх абарачальная дэфармацыя абумоўлена энтрапійным эфектам выпрастання і аднаўлення скручанай канфігурацыі ўчасткаў макрамалекулярных ланцугоў, размешчаных паміж «вузламі». С. II тыпу — гетэрагенныя сістэмы, якія ўзнікаюць пры распадзе гамагенных растворaў палімераў на 2 фазы: канцэнтраваную (мае значную колькасць палімеру), якая ўтварае неперарыўны каркас, і фазу з вельмі нізкай канцэнтрацыяй палімеру, уключаную ў каркас у выглядзе дысперсіі. Фазавы распад абумоўлены зменай актыўнасці растваральніку ў выніку ўвядзення ў раствор асаджальнікаў або рэзкай змены т-ры раствору. Утварэнне С. адыгрывае важную ролю пры тэхнал. перапрацоўцы палімераў (напр., пры фармаванні валокнаў і плёнак), харч. прадуктаў, у біял. працэсах. Гл. таксама *Сінерэзіс*.

СТУ́ДНЯ, к а л о д з е ж, гідратэхнічнае збудаванне ў выглядзе свідравіны (квадратнай ці круглай у плане шахты) для здабычы грунтавых вод. Мае наземны



Студня ў г. Браслаў Віцебскай вобл.

засцерагальны зруб (выш. да 1,5 м) і пад'ёмнае прыстасаванне. Вядомы С. драўляныя зрубныя (часам з дубовых плах) і з жураўлём, *калаўротам* і без пад'ёмнага прыстасавання (у раёнах з высокім узроўнем грунтавых вод). На змену зрубнай С. з жураўлём з 1920-х г. паступова прыйшла С. з труб з калаўротам. Часта С. накрываюць 2-схільнай ці шатровай стрэшкамі, аздабляюць разьбой.

С.А.Сергачоў.

СТУ́ДЫІ БЕЛАРУ́СКАГА ТЭА́ТРА ІМЯ ЯКУ́БА КО́ЛАСА. Дзейнічалі ў 1928—64 пры *Беларускім акадэмічным тэатры імя Якуба Коласа* (цяпер Нац. акад. драм. т-р імя Я.Коласа) для прафес. падрыхтоўкі маладых акцёраў. Спалучалі навуч.-пед. работу з практыкай у т-ры.

Студыя 1928—31. Маст. кіраўнік М.Міцкевіч. Педагогі: Ц.Сяргейчык і Міцкевіч (майстэрства акцёра), К.Саннікаў (сцэн. рух і пластыка), А.Ільінскі (грым), С.Стэльмах (сцэн. мова), А.Некрашэвіч (грамадскія дысцыпліны). Студыйцы: Л.Будзько, А.Загавалка, І.Матусевіч, А.Сакалоў, У.Стэльмах, А.Трус, І.Тупік, А.Шэлег. Студыйныя работы — фрагменты з твораў А.Астроўскага, М.Горкага, А.Чэхава, Я.Купалы, Я.Коласа, спектакль «Авангард» В.Катаева і інш.

Студыя 1931—33. Маст. кіраўнік Міцкевіч. Педагогі: Міцкевіч, С.Розанаў, Саннікаў, Сяргейчык (майстэрства акцёра), С.Стэльмах (сцэн. мова). Студыйцы: А.Багданава, Л.Вальчэцкі, Т.Заранок і інш. Паст. спектакль «Цудоўны сплаў» У.Кіршона з удзелам былых выпускнікоў.

Студыя 1934—38. Маст. кіраўнік Сяргейчык. Педагогі: Ільінскі і П.Малчанаў (майстэрства акцёра), Ю.Чарноў (сцэн. мова), Л.Маркевіч (муз. грамата) і інш. Студыйцы: П.Бялевіч, Т.Зорына, З.Канапелька, У.Латоўскі, М.Маркоўская і інш. Студыйныя работы — урыўкі з п'ес «Пінская шляхта» В.Дуніна-Марцінкевіча, «Паўлінка» Я.Купалы, «Вайна вайне» Я.Коласа, спектаклі «Мяшчане» М.Горкага, «Дзеці Ванюшына» С.Найдзёнава і інш.

Студыя 1939—41. Маст. кіраўнік В.Аксёнаў. Педагогі: Ільінскі і Сяргейчык. Спыніла работу з пач. Вял. Айч. вайны.

Студыя 1945—48. Маст. кіраўнік Сяргейчык. Педагогі: А.Гарэлаў, Ільінскі, Л.Мазалеўская, Малчанаў, А.Радзялоўская, Ф.Шмакаў. Студыйцы: Г.Арлова, А.Лапо, А.Мельдзюкова, М.Яроменка і інш. Паст. спектакль «Старыя сябры» Л.Малюгіна.

Студыя 1956—58. Маст. кіраўнік Сяргейчык. Педагогі: Я.Буракоў, Н.Лойтар, А.Скібнеўскі, Шмакаў. Студыйцы: С.Васільева, Ж.Галабурдзіна, Б.Крупскі, Л.Куцькіна, В.Петрачкова, З.Раманава, Л.Самсонава, У.Унукаў, А.Шчапанкін. Студыйныя работы — урыўкі з твораў Астроўскага, А.Пушкіна, Чэхава, К.Крапівы, Я.Райніса.

Студыя 1962—64. Маст. кіраўнік Б.Браганцаў, з 1963 І.Папоў, заг. студыі Шэлег. Педагогі: Буракоў, Радзялоўская, Сяргейчык, Шмакаў. Студыйцы: А.Атаршчыкаў, А.Забалотнікаў, Л.Заграбельная, Г.Каралькова, М.Колас, М.Марозава, Л.Пісарава, У.Рошчын, В.Старыковіч. Студыйныя работы — урыўкі з твораў «Беспасажніца» Астроўскага, «Рэвізор» М.Гогаля, «Хлопец з нашага горада» К.Сіманава, «Акіян» А.Штэйна.

Літ.: Н я ф ё д У. Беларускі тэатр імя Якуба Коласа. Мн., 1976; Гісторыя беларускага тэатра. Т. 2—3. Мн., 1985—87.

Ю.М.Сохар.

СТУ́ДЫІ БЕЛАРУ́СКАГА ТЭА́ТРА ІМЯ ЯНКІ КУПА́ЛЫ. Дзейнічалі ў 1932—69 пры Бел. т-ры імя Я.Купалы (гл. *Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы*) для прафес. падрыхтоўкі маладых акцёраў. Спалучалі навуч.-пед. работу з практыкай у т-ры.

Студыя 1932—34. Маст. кіраўнік Л.Літвінаў, заг. студыі П.Данілаў, з 1933 Я.Рамановіч. Педагогі: В.Галіна, У.Крыловіч, У.Уладамірскі і інш. Студыйцы: М.Абраменка, Г.Відаўская, А.Гучко, Г.Панкрат, К.Шайкоўскі і інш. Студыйныя работы — спектаклі «Бацькаўшчына» К.Чорнага, «Сваты» І.Гурскага.

Студыя 1936—38. Маст. кіраўнік Літвінаў, заг. студыі Рамановіч. Педагогі: Галіна, Данілаў, Літвінаў (майстэрства акцёра), Л.Рахленка (сцэн. мова), І.Швец (сцэн. рух). Студыйцы: А.Абрашкевіч, С.Бульчык, У.Гарачун, Л.Гілевіч, Г.Макарава (Апанасчык), А.Маркавец, С.Саўчук, В.Семянюк, А.Усенка, С.Яворскі. Паст. спектакль «Слуга двух гаспадароў» К.Гальдоні.

Студыя 1945—48. Маст. кіраўнік Е.Міровіч, з 1946 Літвінаў, заг. студыі Б.Янпольскі. Педагогі: Галіна і В.Галаўчынер (майстэрства акцёра), П.Іваноў (сцэн. мова), К.Ціхаміраў (танец і рытміка руху), Б.Кудраўцаў (грым), У.Няфёд (гісторыя т-ра), Дз.Румянцаў (гісторыя л-ры). Студыйцы: М.Бацян, М.Зінкевіч, Я.Кавалёва, Т.Кін-Камінскі, Н.Краўцова, В.Краўчанка, У.Кудрэвіч, М.Лапідус, А.Рынковіч, І.Сіповіч, Г.Уладамірская, Л.Чыжэўская. Студыйныя работы — фрагменты з твораў А.Фадзеева, А.Куляшова, А.Пушкіна, М.Гогаля, Гальдоні, спектаклі «Апошнія» М.Горкага, «Дарагі госць» Ю.Рудзько.

Студыя 1956—58. Маст. кіраўнік Рахленка. Педагогі: А.Архангельскі, Галіна, Няфёд. Студыйцы: М.Бабок, В.Белахвосцік, Г.Вавула,

М.Калінін, А.Кацельнікаў, Дз.Ніжнікоўская, Л.Хейфец. Студыйныя работы — фрагменты з твораў М.Святлова, Я.Васілёнка, А.Каплера.

Студыя 1967—69. Маст. кіраўнік Рахленка, заг. студыі Я.Громаў. Педагогі: Б.Луцэнка, В.Раеўскі, Уладамірская, Б.Эрын (майстэрства акцёра), З.Браварская (сцэн. мова), А.Першыц (сцэн. пластыка), А.Лабовіч (гісторыя т-ра). Студыйцы: М.Бараш, Б.Бруснікаў, Л.Зорына, А.Кашпераў, У.Кошаль, У.Краснапераў, Т.Кротава, І.Кушалевіч, Л.Лой, М.Лур'е, А.Марцынюк, А.Падабед, Т.Скудная, У.Сячэйка, Т.Юдзіна. Студыйныя работы — фрагменты з твораў Ф.Шылера, М.Горкага, В.Розава, Л.Зорына і інш., спектаклі «Хто смяецца апошнім» К.Крапівы, «На ўсякага мудраца хапае прастаты» А.Астроўскага (1-ы акт).

Літ.: Няфёд У. Беларускі акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы. Мн., 1970; Гісторыя беларускага тэатра. Т. 2—3. Мн., 1985—87.

Ю.М.Сохар.

СТУ́ДЫІ ТЭЛЕБА́ЧАННЯ абласныя, творчыя калектывы, якія рыхтуюць тэлевізійныя перадачы для пэўнага рэгіёна; уваходзяць у склад *Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь*. Працуюць у Гомелі (з 1958), Віцебску (з 1960), Брэсце (з 1961), Гродне (з 1969), Магілёве (з 1989). Да 1964 вялі вяшчанне аўтаномна. Працяглы час іх перадачы выходзілі на адным канале з рэсп. і агульнасаюзнай праграмамі з сярэднясутачным уласным вяшчаннем па 1 гадз. У апошнія гады аб'ём вяшчальных перадач складае 4—6 гадз. Рыхтуюць перадачы і праграмы розных тэматычных кірункаў: інфарм., грамадскія, сац.-эканам., дзіцячыя, муз., забаўляльныя і інш. Актыўна супрацоўнічаюць з *Рэспубліканскай студыяй тэлебачання*, рэгулярна выходзяць з уласнымі відэасюжэтамі ў праграмах бел. тэлебачання «Навіны», «Панарама», «Планета «Арт». *Л.Ф.Шылава.*

СТУ́ДЫЯ (італьян. studio ад лац. studeo старанна працую, займаюся), 1) майстэрня жывапісца, скульптара, фатографа і інш. 2) У тэатры — творчы калектыў, які спалучае навуч., эксперым. і вытв. (паказ спектакляў) задачы. Стварaліся пры буйных тэатр. калектывах і развівалі іх творчыя прынцыпы, або арганізоўваліся самастойна і займаліся пошукамі новых сродкаў сцэн. выразнасці. Асабліва пашыраны ў 1920—30-я г.: С. пад кіраўніцтвам Я.Вахтангава, Ю.Завадскага, Р.Сіманава, А.Дзікага, М.Хмялёва ў Маскве, С.Радлава ў Ленінградзе і інш. С. часта служылі асновай і базай для стварэння новых т-раў, падрыхтоўкі акцёрскіх кадраў: С. пры Маскоўскім Маст. акад. т-ры, *Беларуская драматычная студыя* ў Маскве (1921—26), *Беларуская студыя оперы і балета* (1930—33), *Беларуская студыя* пры Цэнтральным тэатральным вучылішчы ў Ленінградзе (1933—37), *Студыі Беларускага тэатра імя Якуба Коласа* (1928—64), *Студыі Беларускага тэатра імя Янкі Купалы* (1932—69). У Мінску працуюць *Оперная студыя Беларускай акадэміі музыкі, Тэатр-студыя кінаакцёра*. 3) Школа прасцейшага тыпу (муз., тэатр., оперная, балетная). Існуюць пры палацах і дамах культуры, клубах і інш. 4) Радыёстудыя, тэлевізійная С. — творчы калектыў для стварэння радыё- і тэлеперадач; абсталяванае спец. апаратурай памяшканне для радыёвяшчання і тэлеперадач (гл. таксама *Студыі тэлебачання* абласныя).

С. ёсць у кіно (гл. *Кінастудыя*), цыркавым мастацтве і інш.

СТУ́ДЫЯ ВАЕ́ННЫХ МАСТАКО́Ў імя М.Б.Грэкава. Створана ў Маскве ў 1934—35 як навучальная студыя самадз. мастакоў-чырвонаармейцаў пры асобнай кав. брыгадзе, потым пры Палiт. управленні Маск. ваен. акругі, у 1943—91 пры Гал. палітупраўленні Сав. арміі і ВМФ. З 1940 арг-цыя прафес. мастакоў. Названа ў гонар мастака-баталіста М.Б.*Грэкава*. Паўплывала на развіццё батальнага жанру, станаўленне мастацтва дыярам і панарам. Сярод вядучых майстроў студыі М.Авечкін, Я.Вучэціч, І.Еўсцігнееў, М.Жукаў, П.Крываногаў, П.Мальцаў, М.Самсонаў.

Літ.: Востоков Е. Грековцы. 2 изд. М., 1983.

«СТУДЭ́НЦКАЯ ДУ́МКА», грамадска-палітычны, навук. і літ. часопіс *Беларускага студэнцкага саюза*. Выдаваўся ў 1924—26, 1928—30, 1935 у Вільні на бел. мове. Рэдактары-выдаўцы: А.Зянюк, І.Гагалінскі, Я.*Шутовіч*, М.*Шкялёнак*, С.*Станкевіч*, М.Якімец. Часопіс імкнуўся прадстаўляць «агульны ідэйны кірунак адраджэнскай беларускай моладзі». Змяшчаў хроніку найважн. падзей грамадска-паліт. і нац.-культ. жыцця ў Зах. Беларусі, БССР, Чэхаславакіі, Латвіі, падрабязна асвятляў дзейнасць саюза, змяшчаў паведамленні аб працы Т-ва прыяцеляў беларусаведы, пра ўдзел вучняў Віленскай бел. гімназіі ў нац.-вызв. барацьбе. Шмат увагі аддаваў *Аб'яднанню беларускіх студэнцкіх арганізацый* у Празе, гісторыі бел. студэнцкага руху, збіральніцтву і папулярызацыі гіст.-культ. спадчыны Беларусі. Узнімаў праблемы філасофіі, культуралогіі і паліталогіі, нац.-культ. адраджэння, псіхалогіі. Змяшчаў літ.-знаўчыя і навук. працы, лекцыі, успаміны, паэт. творы, запісы вуснай нар. творчасці, апавяданні, рэпрадукцыі карцін. Выйшла 15 нумароў, з іх 1 канфіскаваны.

А.М.Вабішчэвіч.

СТУДЭ́НЦКАЯ ЛЯВІ́ЦА «ФРОНТ», гл. ў арт. *«Фронт»*.

СТУЖАЧНАПІ́ЛЬНЫ СТАНО́К, тып *дрэварэзальнага станка* для падоўжнага распілоўвання бярвён, брусоў, тоўстых дошак у лесапільнай вытв-сці або для падоўжнага, папярочнага, змешанага ці крывалінейнага раскрою піламатэрыялаў і ліставых драўняных матэрыялаў у дрэваапрацоўчай, мэблевай і інш. вытв-сцях.

Дрэварэзальны інструмент С.с. — стужачная піла, нацягнутая на 2 шківах, якая ўтварае ў драўніне вузкі прапіл і дае магчымасць выпілоўваць загатоўкі крывалінейнага контуру. Адзін з шківаў вядучы, другі мае прыстасаванне для націяжэння пілы. С.с. выпускаюцца з гарыз. і верт. размяшчэннем стужачнай пілы.

СТУ́ЖАЧНАЯ СЯЎБА́, радковая сяўба, пры якой чаргуюць шырокія міжраддзі паміж групамі радкоў з вузкімі паміж радкамі. Выкарыстоўваюць для культур з невял. плошчай жыўлення (проса, морква, радыска, цыбуля, буракі сталовыя і інш.). Дазваляе найб. эфектыўна змагацца з пустазеллем, эканомна выкарыстоўваць глебавую вільгаць.

СТУ́ЖАЧНІКІ (Ladoga, Limenitis), род дзённых матылёў сям. німфалід. Пашыраны ва ўмераных шыротах і субтропіках Паўн. паўшар'я. Ва Усх. Еўропе і Азіі 9 відаў. Жывуць у лясах, парках, уздоўж лясных дарог. На Беларусі 2 віды: С. таполевы (Limenitis populi) і С. Камілa, або малы (L. camilla).

Размах крылаў да 80 мм; пярэднія шырокія, з папярочнай жылкай, зверху чорныя ці бурыя, з белым малюнкам, з зял. і сінім адлівам, знізу ржава-чырв.; заднія са звілістым краем. Дарослыя кормяцца сокам дрэў, інш. арган. рэчывамі. Вусені С. таполевага жывуць на таполях і асінах, С. Камілa — на бружмелі; кормяцца лісцем. *С.Л.Максімава.*



Стужачнікі: 1 — Камілa; 2 — таполевы (а — імага; б — вусень; в — кукалка).

СТУ́ЖАЧНІЦЫ, стужкі ордэнскія, некалькі блізкіх родаў (Catocala, Ephesia, Mormonia і інш.) матылёў сям. совак. Пашыраны ў Еўразіі і Паўн. Амерыцы. Жывуць пераважна ў шыракалістых і поймавых лясах. Большасць відаў актыўныя на змярканні і ўначы. Некат. — шкоднікі лясных і культ. раслін. На Беларусі 16 відаў. Часцей трапляюцца С. ружовая (Catocala pacta) і С. звычайная чырв. (C. nupta). З віды С. занесены ў Чырв. кнігу: блакітная (C. fraxini), малінавая (C. sponsa) і пуэрпера (C. puerpera).



Стужачніцы: 1 — блакітная; 2 — малінавая; 3 — ружовая; 4 — пуэрпера.

Размах крылаў да 12 см. Афарбоўка пярэдніх — пад малюнак кары, задніх — яркія, з перавязямі (адсюль другая назва). Вусікі шчацінкападобныя. Лічынкі (вусені) маюць 3—5 пар брушных ножак; кормяцца лісцем дрэў і кустоў, пераважна букавых, вярбовых і ружавых. *С.Л.Максімава.*

СТУ́ЖАЧНЫЯ ЧЭ́РВІ, цэстоды (Cestoda), клас тыпу плоскіх чарвей. 9—10 атр., больш за 3 тыс. відаў. Небяспечныя паразіты кішэчніка, радзей інш. органаў пазваночных жывёл і чалавека (канчатковыя гаспадары), узбуджальнікі *цэстадозаў*. На Беларусі найб. адзначаюцца прадстаўнікі атр. *стужачнікаў* і *цэпняў*.

Даўж. ад 0,5 мм да 30 м. Цела доўгае, пляскатае, стужкападобнае; маюць галоўку (сколекс) з апаратам прымацавання (батрыдыі, ботрыі, кручкі, прысмоктвальныя ямкі, прысоскі, хабаткі), шыйку (зона росту) і стробілу, якая мае ад аднаго да некалькіх тысяч членікаў (праглатыдаў). Ёсць нерв. і выдзяляльная сістэмы; органаў дыхання, кровазвароту і стрававання няма. Пажыўныя рэчывы ўсмоктваюцца паверхняй цела. Гермафрадыты. Развіццё з ператварэннем і зменай гаспадароў. Прамежкавыя гаспадары — беспазваночныя (малюскі, насякомыя, ракападобныя) і пазваночныя ўсіх класаў, у якіх зародак ператвараецца ў лічынку.

СТУ́КА, стук (італьян. stucco, франц. stuc, ням. Stuck), штучны мармур, матэрыял для дэкар. аздаблення сцен і арх. дэталей інтэр'ера будынка. Вырабляюць з абпаленага і здробненага гіпсу, злучанага з галыном і клеем, часам з дамешкамі мармуровай пудры. Элементы аздаблення са С. вырабляюць у тэхніках лепкі або фармавання, шліфуюць і паліруюць да люстранога бляску, часам таніруюць; пашырана таксама разьба па С. Вядомы са старажытнасці, на Беларусі пашыраны з 17 ст. ў аздабленні інтэр'ераў палацаў культавых, пазней і грамадскіх будынкаў.

СТУКА́ЛІЧ Уладзімір Казіміравіч (9.11.1858, г. Екабпілс, Латвія — 18.10.1918), бел. гісторык і краязнавец, літаратуразнавец. Скончыў Пецярбургскі ун-т (1883), удзельнічаў у рэв. руху. Працаваў у казённай палаце ў Слоніме, Гродне, Віцебску (памочнік прысяжнага павераната). Чл. *Віцебскай вучонай архіўнай камісіі*. У 1886—1900 друкаваўся ў газ. «Русский курьер» як літаратуразнавец (пад псеўд. Вяневіч). Аўтар прац «Да пытання аб арганізацыі універсітэта ў Віцебску» (1903), «А.П.Сапуноў. Да 25-годдзя яго навуковай і літаратурнай дзейнасці» (1905), «М.Я.Нікіфароўскі, 1845—1910 гг.» (1910), артыкулаў па краязнаўстве Беларусі, гісторыі бел. гарадоў. Быў у сяброўскіх адносінах з І.Я.Рэпіным.

Літ.: Падліпскі А. Летапісец Віцебшчыны. Мн., 1993. *Дз.У.Караў.*

СТУКА́ЛКІНА Ніна Міхайлаўна (26.8.1905, с. Кузнечка Цвярской вобл., Расія— 2.3.1999), расійская артыстка балета, педагог, балетмайстар. Засл. арт. Расіі (1956). Скончыла Петраградскае тэатр. вучылішча (1922). У 1922—57 салістка Ленінградскага т-ра оперы і балета імя С.Кірава. Балетмайстар-рэпетытар Узб. т-ра оперы і балета імя А.Наваі (1968—71), Дзярж. т-ра оперы і балета Беларусі (1960—64 і 1971—73), Чувашскага муз. т-ра (1978—83). Выкладала ў ленінградскіх т-рах оперы і балета (1950—58), музкамедыі (1953—58), харэаграфічным вучылішчы (1958—69). На бел. сцэне ўдзельнічала ў паст. балетаў (сумесна з А.Андрэевым): «Мара» Я.Глебава (1961), «Святло і цені» Г.Вагнера, «Балеро» М.Равеля, «Трыстан і Ізольда» Р.Вагнера (усе 1963).

СТУ́ПА, традыцыйная прылада для апрацоўкі зерня на крупы ў розных народаў. Выкарыстоўвалася і для інш. мэт. На Беларусі былі пашыраны ручная і нажная С. Ручную рабілі з кавалка тоўстага ствала дуба, граба, часам тополі або ліпы вышынёю 110—120 см. У ствале выдзёўбвалі ці выпальвалі конусападобную выемку глыбінёй 40—50 см. Зерне ў С. таўклі таўкачом — тоўстай палкай з паўкруглымі канцамі, даўжынёй да 90—100 см. Часта таўклі ў 2 таўкачы. Нажныя С. бытавалі на Палессі, часткова на Міншчыне (пры раскопках Мінскага замчышча 11—12 ст. знойдзены 2 нажныя і 1 ручная С.). Вышыня нажной С. 50—60 см. У 4-вугольным або круглым цурбане (калодзе) выдзёўбвалі конусападобную ці круглую адтуліну для зерня. Калоду нярэдка ўкопвалі ў зямлю. Таўкач мацавалі на канцы доўгага бруса (рычага), замацаванага рухома на восі ці на падстаўцы. Рычаг прыводзіўся ў рух нагою.

Л.І.Мінько.



Да арт. **Стужачныя чэрві**. Тыпы будовы сколексаў: 1 — похва, у якую ўцягваецца хабаток; 2 — прысмоктвальныя ямкі; 3 — хабаткі з кручкамі; 4 — кручкі; 5 — прысоскі.



Ступы: ручныя, нажная (ніжняя).

СТУ́ПА (санскр. — макушка, кучка зямлі, камянёў), у будыйскай архітэктуры манументальнае сімвалічнае і мемар. збудаванне; сховішча рэліквій. Першапачаткова — збудаванне на магіле цара ці правадыра. Найб. ранніе С. (3—2 ст. да н.э., Індыя) мелі 3-часткавую структуру: ступеньчаты падмурак, масіўны асн. аб'ём, увянчанне пабудовы ў выглядзе шмат'яруснага парасона. З першых стагоддзяў да н.э. вядомы паўсферычныя С., пазней — вежападобныя (В'етнам, Кітай), звонападобныя (М'янма, Тайланд, Камбоджа, Інданезія), бутлепадобныя (Манголія, Кітай). У дэкоры С. выкарыстоўвалі расфарбоўку, пазалоту.

Назва «С.» характэрна для Індыі і Непала; у Шры-Ланцы называецца «дагаба», у М'янме — «зедзі» і «пато», у Тайландзе — «чэдзі» («пра-чэдзі») «пранг» («пра-пранг»), у Лаосе — «тхат», у Манголіі — *субурган*, у Кітаі і В'етнаме — «баота», пагада і г.д.

СТУПАКО́Ў Юрый Фёдаравіч (24.3.1934, с. Рубцава Мыцішчынскага р-на Маскоўскай вобл. — 24.10.1999), бел. акцёр. Нар. арт. Беларусі (1980). З 1957 працаваў у т-рах Ліпецка, Севастопаля, з 1968 у Дзярж. рус. драм. т-ры Беларусі. Выканаўца драм. і характарных роляў. Мастацтва С. вызначаецца глыбінёй пранікнення ў сутнасць вобраза, спалучэннем драм. і камед. пачатку, прастаты знешняга малюнка і псіхал. пераканальнасцю. Сярод роляў у рус. т-ры: Немец («Вяртанне ў Хатынь» паводле А.Адамовіча), Навіцкі, Хазяінаў («Трывога», «Соль» А.Петрашкевіча), Карніла («Знак бяды» паводле В.Быкава), Іван Ільіч («Ноч анёла» А.Разанава), Іван Каламійцаў, Сашін («Апошнія», «На дне» М.Горкага), Пабеданосікаў («Лазня» У.Маякоўскага), маркіз дэ Шарон («Мальер» М.Булгакава), Васкоў («А досвіткі тут ціхія...» паводле Б.Васільева), Макдуф («Макбет» У.Шэкспіра), Шрусберы («Марыя Сцюарт» Ф.Шылера), Рычард («Усё ў садзе» Э.Олбі) і інш. Здымаўся ў кіно. *Г.Г.Бордусава.*

СТУ́ПАР (ад лац. stupor здранцвенне, нерухомасць), стан нерухомасці з аслабленымі рэакцыямі на раздражненне, прыгнечванне псіхічнай актыўнасці чалавека. Адно з найб. цяжкіх псіхапаталаг. расстройстваў, якія ўзнікаюць пры розных *псіхічных хваробах*. Праяўляецца зніжэннем усіх відаў адчувальнасці, нерухомасцю, мутызмам (адсутнасцю моўных зносін з людзьмі).

СТУПЕ́НІ ПАРАЎНА́ННЯ, граматычная катэгорыя якасных прыметнікаў, утвораных ад іх прыслоўяў і безасабова-прэдыктыўных слоў на «-о», «-а», якая выражае адносную розніцу або перавагу ў якасці, што ўласціва прадметам, дзеянням, станам.

У бел. мове адрозніваюць 3 С.п. Звычайная абазначае якасць прадмета або дзеяння без супастаўлення яе з інш. выяўленнем той жа якасці — «зялёны», «стары»; вышэйшая паказвае, што якасць уласціва гэтаму прадмету або дзеянню ў большай меры, чым іншаму. Форма вышэйшай ступені прыметнікаў утвараецца з дапамогай суфікса «-ейш-(-эйш-)», прыслоўяў і безасабова-прэдыкатыўных слоў — суфікс «-ей-(-эй-)»: «зялянейшы», «старэйшы», «даўней», «даўжэй». Пры замене асновы ў асобных выпадках выкарыстоўваецца суфікс «-ш-»: «большы», «меншы», «лепш». Трэцяя С.п. — найвышэйшая — утвараецца з дапамогай прыстаўкі «най-» ад форм вышэйшай ступені: «наймацнейшы», «найдужэй», «найбольш». Адрозненні ў ступені якасці перадаюцца таксама спалучэннямі тыпу «больш моцны», «старэйшы за яго», «смялей за ўсіх» і інш., якія з'яўляюцца аналітычнымі (складанымі) формамі вышэйшай або найвыш. С.п.

Літ.: Беларуская граматыка. Ч. 1. Мн., 1985. *П.П.Шуба.*



Ступа Бадхнатх у Катманду. Фрагмент паўкруглай чашы.



Ступы храмавага комплексу Барабудур на востраве Ява (Інданезія).



Графікі **ступенных функцый**: 1 — лінейнай функцыі $y=x$; 2 — гіпербалы $yx=1$; 3 — парабалы $y=x^2$.

СТУПЕ́НІ СВАБО́ДЫ, 1) у механіцы — незалежныя паміж сабой рухі (перамяшчэнні) мех. сістэмы. Колькасць С.с. залежыць ад колькасці часціц (матэрыяльных пунктаў), што ўтвараюць сістэму, а таксама ад колькасці і характару накладзеных на сістэму *сувязей механічных*.

Свабодная часціца мае 3 С.с. — можа рухацца ўздоўж кожнай з 3 узаемна перпендыкулярных восей каардынат. Свабоднае цвёрдае цела мае 6 С.с.: 3 з іх адпавядаюць *паступальнаму руху* якога-н. пункта С (звычайна цэнтра мас) цела, а астатнія 3 — *вярчальнаму руху* цела вакол пункта С як нерухомага цэнтра. Цвёрдае цела з нерухомай воссю вярчэння мае адну С.с. Колькасць С.с. вызначае лік ураўненняў руху і ўмоў раўнавагі мех. сістэмы.



Ю.Ф.**Ступакоў**.

2) У тэрмадынаміцы — незалежныя параметры тэрмадынамічнай сістэмы (звычайна т-ра, ціск і інш.), змены якіх (у пэўных межах) не парушаюць *раўнавагу тэрмадынамічную* сістэмы. Змена тэрмадынамічных С.с. дапушчальныя ў такіх межах, калі захоўваюцца ўсе фазы, што прысутнічаюць у сістэме, і не з'яўляюцца якія-н. іншыя фазы. Колькасць С.с. ў раўнаважнай тэрмадынамічнай сістэме вызначаецца *Гібса правілам фаз*.

СТУПЕ́ННАЯ ФУ́НКЦЫЯ, функцыя віду $y = x^a$, дзе a — пастаянны лік. Калі a — цэлы лік, то $y = x^a$ — асобны выпадак *рацыянальнай функцыі*. Асобныя выпадкі С.ф.: *лінейная функцыя* $y = x$; квадратычная функцыя (гл. *Парабала*) $y = x^2$; кубічная функцыя (гл. *Кубічная парабала*) $y = x^3$; цэлая рацыянальная функцыя $y = x^n$, дзе n — натуральны лік. Пры камплексных значэннях x і a С.ф. $y = x^a$ неадназначная пры няцэлых a.

СТУПЕ́ННЫ ШЭ́РАГ, функцыянальны шэраг віду

$$a_0 + a_1 z + a_2 z^2 + \ldots + a_n z^n + \ldots,$$

дзе каэфіцыенты $a_0, a_1, a_2 \ldots a_n \ldots$ — камплексныя лікі, не залежныя ад камплекснай пераменнай z. Вобласцю збежнасці С.ш. з'яўляецца адкрыты круг $|z| < R$ з цэнтрам у пункце $z = 0$ (круг збежнасці), ва ўсіх унутраных пунктах якога С.ш. збягаецца абсалютна, па-за яго межамі — разбягаецца, на мяжы — можа быць збежным ці разбежным. Для сапраўдных z круг збежнасці пераўтвараецца ў інтэрвал збежнасці, а сам С.ш. — у *Тэйлара шэраг*. *А.А.Гусак.*

СТУПЕ́НЬ у музыцы, кожны гук муз. *гукараду, гамы, ладу*. Уся муз. шкала падзяляецца на *актавы*, кожная ўключае 7 асн. С. (до—рэ—мі—фа—соль—ля—сі), з якіх утвараецца асн. гукарад, і 5 альтэраваных (павышаных ці паніжаных) С. Побач са складовымі існуюць і літарныя абазначэнні асн. С. (с=до, d=рэ, e=мі, f=фа, g=соль, a=ля, h=сі). Каб вызначыць альтэраваную С., да складу ці літары далучаюць умоўнае абазначэнне знака альтэрацыі (напр., до-дыез=до#=cis). Поўны дыятанічны лад ахоплівае 7 асн. С., якія абазначаюцца рым. лічбамі і маюць спец. назвы (I — тоніка, II — верхні ўводны гук, III — верхняя медыянта, IV — субдамінанта, V — дамінанта, VI — ніжняя медыянта, VII — ніжні ўводны гук). Кожная С. ладу можа альтэравацца, у такім выпадку 7-ступенная дыятанічная гама ладу ператвараецца ў 12-ступенную храматычную.

СТУПЕ́НЬ сапраўднага ліку a з натуральным паказчыкам n, здабытак n сумножнікаў, кожны з якіх роўны a. Запісваецца $a^n = \underbrace{a \cdot a \cdot \ldots \cdot a}_{n \text{ разоў}}$, дзе a — аснова, n — паказчык С., a^n — С.

Паняцце С. абагульняецца на выпадак любога рацыянальнага паказчыка С.: $a^0 = 1$ ($a \neq 0$); $a^{-n} = 1/a^n$ ($a \neq 0$); $a^{m/n} = \sqrt[n]{a^m}$ ($a > 0$, m, n — натуральныя лікі). Асн. дзеянні над С. з дадатнай асновай: $a^n \cdot a^m = a^{n+m}$, $a^n/a^m = a^{n-m}$, $(a^n)^m = a^{nm}$, $(ab)^n = a^n \cdot b^n$, $(a/b)^n = a^n / b^n = a^n \cdot b^{-n}$. У тэорыі аналітычных функцый разглядаюць С. каплексных лікаў з камплекснымі паказчыкамі. *А.А.Гусак.*

СТУПЕ́НЬ АКІСЛЕ́ННЯ, гл. *Акіслення ступень.*

СТУПЕ́НЬ РАКЕ́ТЫ, гл. *Ракетная ступень.*

СТУ́ПКА Багдан Сільвестравіч (н. 27.8.1941, г.п. Кулікоў Жолкаўскага р-на Львоўскай вобл., Украіна), украінскі акцёр, дзярж. дзеяч. Нар. арт. Украіны (1980). Нар. арт. СССР (1991). Скончыў Кіеўскі ін-т тэатр. мастацтва (1984). З 1961 акцёр Львоўскага ўкр. т-ра драмы імя М.Занькавецкай, з 1978 — акад. т-ра імя І.Франко. З 2000 міністр культуры Украіны. Творчая манера С. вызначаецца псіхал. і эмацыянальнай напружанасцю пры строгім знешнім малюнку роляў, сярод якіх: Мікола Задарожны («Украдзенае шчасце» Франко), Дон Жуан («Каменны гаспадар» Л.Украінкі), Вайніцкі («Дзядзька Ваня» А.Чэхава), Васільеў («Выбар» паводле Ю.Бондарава), Тэўе («Тэўе-Таўль» паводле Шолам-Алейхема) і інш. Здымаўся ў кіно: «Белая птушка з чорнай меткай», «Дзеці сонца», «Мікалай Вавілаў», «Дарога ў рай», «Пастка» , «Усход-Захад», «Мазепа» і інш. Дзярж. прэмія СССР 1980. Дзярж. прэмія Украіны 1992.

СТУ́РДЗА-БУЛА́НДРА (Sturdza-Bulandra) Лючыя (25.8.1873, Бухарэст — 19.9.1961), румынская актрыса, тэатр. дзеяч. Нар. арт. Румыніі (1951). Дэбютавала ў 1898 на сцэне Нац. т-ра ў Бухарэсце. У 1914—41 арганізатар (сумесна з Т.Буландрам), актрыса, рэжысёр і дырэктар трупы, якая ў далейшым стала значным т-рам. З 1941 у Муніцыпальным т-ры Бухарэста (з 1961 т-р яе імя). У 1930—61 праф. Бухарэсцкай кансерваторыі. Сярод роляў: Дынеску («Зруйнаваная цытадэль» Х.Лавінеску), лэдзі Чылтэрн («Ідэальны муж» О.Уайльда), Марыя Сцюарт («Марыя Сцюарт» Ф.Шылера), Васа Жалязнова («Васа Жалязнова» М.Горкага) і інш. Дзярж. прэмія Румыніі 1952.



Б.С.**Ступка**.



Р.Л.**Стывенсан**.

СТУ́РУА Роберт Робертавіч (н. 31.7.1938, Тбілісі), грузінскі рэжысёр. Нар. арт. СССР (1982). Скончыў Тбіліскі тэатр. ін-т (1961). З 1962 рэжысёр, з 1979 гал. рэжысёр Тбіліскага драм. т-ра імя Ш.Руставелі. Пастаноўкам уласцівы сінтэз груз. і еўрап. тэатр. культур, імкненне да сац. і філас. абагульненняў, увага да сцэнаграфіі, мізансцэн, муз. афармлення. Сярод спектакляў: «Каўказскі мелавы круг» Б.Брэхта (1978), «Рычард III» (1979) і «Кароль Лір» (1986) У.Шэкспіра, «Пахаванне ў Каліфорніі» Р.Ібрагімбекава (1983) у тбіліскім т-ры; «Брэсцкі мір» М.Шатрова ў т-ры імя Я.Вахтангава, «Гамлет» Шэкспіра ў т-ры «Сатырыкон» (абодва 1988) у Маскве і інш. Дзярж. прэмія СССР 1979.

СТУ́РЭ (Sture), шведскі дваранскі род (дацкага паходжання), рэгенты (правіцелі) Швецыі ў 2-й пал. 15 — пач. 16 ст. Праводзілі палітыку цэнтралізацыі дзяржавы, скасавання *Кальмарскай уніі* і аднаўлення швед. нац. дзяржаўнасці. Стэн С. Старэйшы, рэгент у 1471—97, 1501—03. Кіраваў апалчэннем, якое ў 1471 разбіла армію дацкага караля Крысціяна I. Каб пашырыць эканам. і ваен. рэсурсы кароны, секвестраваў уладанні буйных феадалаў, землеўладанне царквы, забараніў вываз за мяжу каштоўных камянёў. У 1477 заснаваў першы ў Скандынавіі Упсальскі ун-т. Стэн С. Малодшы, рэгент у 1512—20. Праводзіў палітыку па ўзмацненні паўнамоцтваў саслоўнага рыксдага ў процівагу арыстакратычнаму. Смяротна паранены ў час ваен. экспедыцыі дацкага караля Крысціяна II у Швецыю.

СТУ́ЧКА (Stučka) Петэрыс (26.7.1865, б. Кокнеская вол., цяпер Айзкраўкльскі р-н, Латвія — 25.1.1932), латвійскі і рас. паліт. і дзярж. дзеяч, пісьменнік, юрыст. Скончыў Пецярбургскі ун-т (1888). Рэдактар (1888—91, 1895—97) газеты лат. дэмакр. інтэлігенцыі «Dienas lapa» («Штодзённы лісток», Рыга). З 1895 сацыял-дэмакрат. Адзін з заснавальнікаў Лат. с.-д. рабочай партыі (1904) і Камуніст. партыі Латвіі (1919, КПЛ), старшыня Сав. ўрада Латвіі (1918—20). Нарком юстыцыі РСФСР (1917—18), старшыня Вярх. суда РСФСР (1923—32). Адначасова старшыня Замежнага бюро КПЛ і яе прадстаўнік у Камінтэрне (1920—32). Аўтар сатыр. зб. «Маленькія авадні» (1888, з Я.*Райнісам*), літ.-крытычных артыкулаў, успамінаў, прац па тэорыі дзяржавы і права, грамадз. праве. Гал. рэдактар «Энцыклапедыі дзяржавы і права» (т. 1—3, 1925—27).

СТШАМІ́НСКІ Уладзіслаў Максімілянавіч, гл. *Страмінскі* У.М.

СТШЫ́ЖАЎСКАЯ КУЛЬТУ́РА, археалагічная культура плямён, помнікі якой выяўлены ва ўсх. частцы Люблінскага ваяв. (Польшча) і ПнЗ Валыні (Украіна); адна са *шнуравой керамікі культур*. Датуецца 1800—1500 да н.э. Вылучыў у 1959 А.Гардаўскі, назва ад паселішча каля в. Стшыжаў Люблінскага ваяв. Асн. занятак насельніцтва — земляробства і жывёлагадоўля. Паселішчы размяшчаліся на мысах ці берагавых схілах рэк, узвышшах сярод балот. Жытлы — авальныя паўзямлянкі з уступамі-лежанкамі ўздоўж сцен, пл. каля 10 м². Пахавальны абрад — трупапалажэнне ў грунтавых і падкурганных ямах. Нябожчыкаў хавалі ў скурчаным становішчы. Знойдзены посуд (амфары, гаршкі, міскі, кубкі), крамянёвыя прылады працы і паляўнічая зброя (сякеры, сярпы, наканечнікі коп'яў), каменныя зерняцёркі, шліфаваныя пліткі і свідраваныя сякеры; бронзавыя сякеры, падвескі, бранзалеты, скроневыя кольцы, завушніцы, дыядэмы, пранізкі: касцяныя праколкі, шпількі, іголкі і інш. Даследчыкі адзначаюць падабенства паміж помнікамі С.к. і *шнуравой керамікі Палесся культуры*.

СТЫ́ВЕНСАН (Stevenson) Роберт Льюіс Бэлфур (13.11.1850, г. Эдынбург, Вялікабрытанія — 3.12.1894), англійскі пісьменнік; найбуйнейшы прадстаўнік *неарамантызму*. Скончыў Эдынбургскі ун-т (1873). Па адукацыі юрыст. Шмат падарожнічаў па Еўропе і ЗША. Дэбютаваў у 1866 як публіцыст. Сусв. вядомасць прынёс раман «Востраў скарбаў» (1883, неаднаразова экранізаваны). Аўтар прыгодніцкіх раманаў «Выкрадзены» (1886), «Гаспадар Балантрэ» (1889), «Пацярпелыя караблекрушэнне» (1892), «Катрыёна» (1893), у якіх тагачаснай цывілізацыі, расізму і каланіялізму проціпастаўляў веру ў людзей, іх высокую духоўнасць. У гіст. раманах «Прынц Ота» (1885), «Чорная страла» (1888), «Сент-Іў» (апубл. 1897, незавершаны)

рамантыка прыгод спалучаецца з дакладным апісаннем экзотыкі і гіст. каларытам. Тэма «двойніцтва» ў філас.-псіхал. рамане «Дзіўная гісторыя д-ра Джэкіля і м-ра Хайда» (1886). Аўтар шматлікіх апавяданняў, нарысаў, п'ес, літ.-крытычных прац. На бел. мову асобныя творы С. пераклалі А.Асташонак, В.Гардзей, Я.Семяжон.

Тв.: Бел. пер. — Востраў скарбаў. Мн., 1993; Чорная страла: Аповесць з часоў вайны Пунсовай і Белай ружы. Мн., 1999; Рус. пер. — Собр. соч. Т. 1—5. М., 1993; Избр. произв. Т. 1—3. М., 1992.

Літ.: Дьяконова Н.Я. Стивенсон и английская литература XIX в. Л., 1984; Олдингтон Р. Стивенсон: Портрет бунтаря: Пер. с англ. М., 1985; Роберт Луи Стивенсон: Биобиблиогр. указ. М., 1958.

Е.А.Лявонава.

СТЫ́ВЕНСАН (Stevenson) Тэафіла (н. 29.3.1952, г. Лас-Тунас, Куба), кубінскі спартсмен (бокс). Засл. майстар спорту СССР (1972). Выступаў на аматарскім рынгу. Чэмпіён XX (1972, г. Мюнхен, Германія), XXI (1976, г. Манрэаль, Канада) і XXII (1980, Масква) Алімп. гульняў у цяжкай вагавай катэгорыі. Чэмпіён свету ў цяжкай (1974, 1978), суперцяжкай (1986) вагавых катэгорыях.

СТЫГАБІЁНТЫ (ад грэч. Styx падземная рака + *біёнт*), жывёлы, што жывуць выключна ў падземных водах. Да іх належаць віды вышэйшых (амфіподы, ізаподы) і ніжэйшых (астракоды, калеподы), ракападобных, некат. малюскі, рыбы. Для іх характэрны рэгрэсіўныя прыкметы (дэпігментацыя покрыва, рэдукцыя органаў зроку, гіпертрафія канечнасцей). Адрозніваюць ад стыгафілаў (жывёл, здольных існаваць і ў паверхневых водах) і стыгаксенаў (жывёл, што выпадкова трапілі ў падземныя воды і адаптаваліся да іх). Гл. таксама *Траглабіёнты*.

СТЫ́ГМЫ (ад грэч. stigma укол, кляймо, пляма) у біялогіі, 1) святлоадчувальныя арганелы; гл. ў арт. *Вочка*. 2) Дыхальцы, вонкавыя дыхальныя адтуліны лёгкіх або трахей у беспазваночных жывёл тыпу аніхафор і наземных членістаногіх. Пра́з С. паветра пранікае ў буйныя трахейныя ствалы. У насякомых 10 пар С., у лічынак, што жывуць у вадзе, — 1 пара. Калі С. шмат, паветра ўваходзіць праз адны С. (звычайна пярэднія), выходзіць праз другія. С. таксама — шматлікія шчэлепныя адтуліны ў глотцы *асцыдый*.

СТЫКО́ЎКА ў касманаўтыцы, збліжэнне і механічнае злучэнне на арбіце або траекторыі палёту 2 ці больш *касмічных апаратаў* (КА) ці іх асобных частак.

Мэта С. — злучэнне касм. карабля (КК) з арбітальнай станцыяй для дастаўкі экіпажа, грузу і паліва, КК паміж сабой ці з ракетнай ступенню для выканання сумеснага палёту, зборка буйнагабарытных арбітальных станцый ці міжпланетных караблёў з асобных модуляў і інш. Выконваецца аўтаматычна ці з выкарыстаннем касманаўтамі сродкаў кіравання. Мех. злучэнне пры С. праводзіцца пры дапамозе стыковачных агрэгатаў, устаноўленых на КА, якія забяспечваюць першапачатковую счэпку, паглынанне энергіі сутыкнення, выраўноўванне КА, іх сцягванне да стварэння жорсткага злучэння. Пры зборцы буйнагабарытных канструкцый злучэнне КА ці модуляў можа выконвацца таксама з выкарыстаннем маніпулятараў. Першая ручная С. праведзена 16.3.1966 (С. касм. карабля «Джэміні-8» з ракетай «Аджэна», ЗША), аўтаматычная — 30.10.1967 (С. ШСЗ «Космас-186» і «Космас-188», СССР). Метадам С. разнастайных блокаў праводзіцца зборка Міжнар. касм. станцыі.

У.С.Ларыёнаў.

СТЫКС (грэч. Styx), у старажытнагрэчаскай міфалогіі багіня аднайм. ракі ў царстве мёртвых. У розных версіях міфа С. — дачка *Акіяна* і тытаніды Тэфіды альбо бога цемры Эрэба і *Нікты* (Ночы). Падчас спрэчак багі на беразе р. Стыкс кляліся яе вадой, і гэтая клятва лічылася самай свяшчэннай.

СТЫЛАБА́Т (грэч. stylobatēs ад stylos калона + bainō ступаю), платформа ступеньчатага цокаля (стэрэабата) старажгрэч. храма, на якой узводзіліся калоны ці будынак. Пазней С. наз. ўвесь 3-ступеньчаты цокаль храма. У бел. архітэктуры С. меў пашырэнне ў перыяд класіцызму (напр., Гомельскі Петрапаўлаўскі сабор). У наш час сустракаецца ў мемар. архітэктуры (помнікі, надмагіллі і інш.).

В.Ф.Валошын.

СТЫЛЕ́Т (ад італьян. stiletto), колючая *халодная зброя*, разнавіднасць *кінжала*.





Стыкоўка касмічных караблёў «Саюз» і «Апалон». *а*) «Саюз»: 1 — арбітальны адсек; 2 — стыковачная мішэнь; *б*) «Апалон»: 3 — накіравальны выступ стыковачнага агрэгата; 4 — 5 — люк стыковачнага агрэгата; 6 — стыковачны агрэгат.

Да арт. **Стыкоўка**. Стыковачнае ўстройства: 1 — пасіўны і 2 — актыўны стыковачныя агрэгаты; 3 — шаравы шарнір; 4 — галоўка.



Стылабат.

Развіўся з метал. інструмента для пісьма — *стыло* (адсюль назва). Меў звычайна трохгранны або прамавугольны тонкі завостраны клінок і крыжападобную рукаятку. Насілі С. у ножнах на набедраным поясе як парадную зброю (упрыгожанне). Найб. пашыраны ў 15—17 ст. у Італіі і інш. краінах Зах. Еўропы.



Стылет узору 17 ст.

СТЫ́ЛІ МО́ВЫ, стылі функцыянальныя, разнавіднасць мовы з пэўнымі асаблівасцямі фанет., лексічных, марфал., сінтаксс. сродкаў, адбор якіх залежыць ад задач камунікацыі. Іх існаванне абумоўлена патэнцыяльнымі рэсурсамі мовы, яе сінанімікай. Для фарміравання функцыян. С.м. патрэбны і знешнія, экстралінгвістычныя фактары, што вызначаюць умовы адбору моўных адзінак: форма зносін (вусная і пісьмовая, дыялагічная і манералагічная), сац. сфера зносін (быт., вытв., дзярж. і г.д.), змест інфармацыі (тэма і прадмет выказвання), мэта і ўмовы зносін (характар узаемаадносін удзельнікаў акта камунікацыі: паведамленне, просьба, загад і г.д. Вылучаюць *размоўны стыль, афіцыйна-дзелавы стыль, навуковы стыль, публіцыстычны стыль, мастацкі стыль*. Усе С.м., акрамя размоўнага, — *кніжныя стылі*. Межы паміж С.м. адносныя, умоўныя. Ім аднолькава ўласціва тэндэнцыя да раздзялення, дыферэнцыяцыі і тэндэнцыя да ўзаемапранікнення, узаемаўплыву і нейтралізацыі стылявых моўных сродкаў. С.м. вывучае *стылістыка*.

Літ.: Юрэвіч А.К. Стылістыка беларускай мовы. Мн., 1983; Цікоцкі М.Я. Стылістыка беларускай мовы. 2 выд. Мн., 1995.

А.К.Юрэвіч.

СТЫЛІЗА́ЦЫЯ (франц. stylisation ад style стыль), у літаратуры — свядомае мэтанакіраванае перайманне, імітацыя характэрных рыс *стылю* пэўнага пісьменніка або групы пісьменнікаў, літ. школы, плыні, пэўных жанраў фальклору, дыялектаў, гаворак.

Як сродак маст. адлюстравання С. дае магчымасць пісьменніку пераўвасабляцца ў інш. чалавека — выдуманага ім аўтара, пранікаць у чужую свядомасць і выяўляць яе праз асаблівасці маўлення («Вечары на хутары каля Дзіканькі» М.Гогаля, творы Казьмы Пруткова, быліцы Навума Прыгаворкі ў В.Дуніна-Марцінкевіча, «Дудка беларуская» і «Смык беларускі» Ф.Багушэвіча).

С. адлюстроўвае спецыфіку размоў дзейных асоб як прадстаўнікоў сац. ці этнагр. груп насельніцтва, што актывізуе працэс індывідуалізацыі, тыпізацыі («Тралялёначка» і «Сведка» Багушэвіча, «Несцерка» А.Вольскага). С. адрозніваецца і ад мех. перайманння вонкавых рыс стылю без ідэйна-маст. патрэб у гэтым, і ад парадзіравання (гл. *Пародыя*), калі рэзка падкрэсліваюцца рысы прататыпнага стылю, які служыць узорам, сродкам для стылізатара. Знешняе перайманне ўзору, падробка пад нар. мову, капіраванне элементаў паэтыкі розных кірункаў і плыней вядзе да псеўдастылізацыі, дэкаратыўнасці, *эпігонства* і эклектыкі. С., асабліва фалькл., пашыраецца і актывізуецца ў час стылявых пераходаў ад аднаго маст. метаду да другога, ад старога стылю да новага, у працэсе ўзбагачэння літ. мовы нар. гаворкай (казкі А.Пушкіна і У.Даля, «Канёк-Гарбунок» П.Яршова, «Ляўша» М.Ляскова, гавэнды і вершы на бел. мове У.Сыракомлі, «Пінская шляхта» Дуніна-Марцінкевіча, «Казкі жыцця» Я.Коласа і інш.). Неабходнасць стылявога абнаўлення вымушае актыўна звяртацца да С. і сучасных бел. паэтаў (Р.Барадулін, Я.Сіпакоў і інш.). Найб. пашыраная праява С. — *сказ*, стылявым узорам якога ў л-ры выступае вусна-размоўная, па-мастацку не арганізаваная гутарка. Фалькл. С. арыентуецца на вусна-паэтычную, па-мастацку арганізаваную мову; яе прататып, ці ўзор — пэўны твор фальклору.

У выяўленчым і дэкаратыўна-прыкладным мастацтве, 1) мастацкае абагульненне выяўляемых фігур і прадметаў з дапамогай умоўных прыёмаў, спрашчэння малюнка, формы, колеру, аб'ёму. Пашырана ў розных відах мастацтва для рытмічнай арганізацыі цэласнасці кампазіцыі. Вял. яе роля ў *арнаменце, манументальным жывапісе, плакаце*, дзе выява ператвараецца ў вобразны сімвал, праз які раскрываецца змест. У станковым мастацтве С. надае рысы дэкаратыўнасці, часта служыць больш глыбокаму выяўленню сутнасці зместу праз памяншэнне дэталізацыі і канцэнтрацыю ўвагі гледача на асн. характэрных рысах аб'екта твора. 2) Імітацыя вобразнай сістэмы і фармальных асаблівасцей гіст. або рэгіянальных *стыляў*, выкарыстаных у новым маст. кантэксце. С. засвойвае, перапрацоўвае і выяўляе ў новай якасці своеасаблівыя рысы культур пры захаванні іх унутр. сутнасці, сімвалічна намякае на першакрыніцу, чым адрозніваецца ад літаральнага пераносу элементаў гіст. твораў у новы маст. кантэкст у *эклектыцы*. Элементы С. вядомы з 17—18 ст. (кітайскія матывы ў дэлфцкім фаянсе ў Нідэрландах, у дэкар.-прыкладным мастацтве Францыі). Найб. пашырылася ў эпоху рамантызму (мастацтва *«назарэйцаў»*, *прэрафаэлітаў*). У Расіі найб. ярка выявілася ў мастацтве пач. 20 ст. (С. мастацтва 17—18 ст. у творчасці мастакоў аб'яднання *«Свет мастацтва»*, С. прымітыву ў жывапісе М.Ларыёнава і Н.Ганчаровай). На Беларусі пашырылася з 1980-х г. з ростам цікаўнасці да нац. гісторыі (С. сармацкага партрэта ў творах Г.Вашчанкі, А.Марачкіна, У.Стальмашонка і інш.).

У архітэктуры С. звязана са свабодным разуменнем маст. зместу і стылю, што паслужылі прататыпам (напр., С. стараж.-рус. архітэктуры ў пабудовах А.Шчусева і У.Пакроўскага ў 1910-я г.). С. класічнай спадчыны (італьян. Адраджэння, рус. класіцызму) характэрна для пабудоў 1930—50-х г. У архітэктуры Польшчы і Зах. Беларусі вядомы мадэрнісцкія С. ў духу нар. дойлідства (жылыя дамы, гасп. пабудовы).

Літ.: Троицкий В.Ю. Стилизация // Слово и образ. М., 1964; Дзюбайла П.К. Праблемы стылю ў сучаснай беларускай прозе. Мн., 1973.

І.С.Шпакоўскі (літаратура), *С.У.Пешын* (выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва), *С.А.Сергачоў* (архітэктура).

СТЫЛІ́СТЫКА, раздзел *мовазнаўства*, які вывучае *стылі мовы*, нормы і спосабы выкарыстання моўных адзінак у залежнасці ад зместу і мэты выказвання, сітуацыі і сферы зносін. У С. гістарычна склаліся і развіваліся 3 асн. кірункі: С. рэсурсаў (апісальная), С. маўлення (функцыянальная), С. мастацкай літаратуры. Першыя 2 кірункі аб'ядноўвае лінгвастылістыка, 3-і кірунак — літаратуразнаўчая С.

Вылучаюць С.: практычную (абгрунтоўвае нормы выкарыстання сінанімічных сродкаў *літаратурнай мовы* ў залежнасці ад зместу і формы зносін), успрымання (даследуе спосабы адэкватнага ўспрымання вобразна-выяўл. сродкаў літ.-маст. твора), параўнальную С. (вывучае ў параўнальным плане стыліст. сістэмы 2 або некалькіх моў, пераважна блізкароднасных), тэкставую (вывучае выяўл. магчымасці тэксту і разглядае яго як семантычна, функцыянальна і структурна завершанае адзінства).

Гал. задача лінгвастылістыкі — вывучэнне заканамернасцей функцыянавання мовы ў розных сферах зносін, якія адпавядаюць пэўнаму віду дзейнасці, сістэмнасці функцыян. стыляў і інш. функцыян.-стылявых разнавіднасцей, прынцыпаў адбору і спалучэння ў іх моўных сродкаў. Важнае месца ў ёй належыць пытанням лексічнай, фразеалагічнай і грамат. сінанімікі, стыліст. афарбоўкі моўных адзінак.

Вылучаюць 2 віды стыліст. афарбоўкі: эмацыянальна-экспрэсіўны (выражэнне эмоцый — урачыстасці, знявагі, пяшчоты, іроніі, фамільярнасці і інш.) і функцыянальна-стылістычны (выкарыстанне ў пэўным стылі навук. тэрмінаў, *дыялектызмаў*, прастамоўнай лексікі і інш.). Традыцыйна ў С. ўключаюць пытанні пра слоўныя вобразныя сродкі (тропы і сродкі экспрэсіўнага сінтаксісу — *рытарычныя фігуры*).

Цэнтр. паняцце С. — *стыль*. Гал. аб'ект яе вывучэння — функцыян. стыль мовы — грамадска ўсвядомленая, унутрана аб'яднаная сістэма моўных сродкаў у пэўнай сферы грамадскай дзейнасці (навук., справавой, публіцыстычнай і інш.). Літаратуразнаўчая С. вывучае мову літ.-маст. твора ў яе суадносінах з вобразнай структурай і ідэйна-тэматычным зместам твора. Гал. прынцып яе вывучэння — сувязь мовы і думкі, што злучае літ.-знаўчую С. з *паэтыкай* і эстэтыкай слова. На Беларусі навук. працы па аналізе мовы і С. твораў маст. л-ры паявіліся ў 1920-я г. (Я.І.Барычэўскі, П.А.Бузук, А.М.Вазнясенскі, М.І.Гарэцкі, М.М.Піятуховіч). У 2-й пал. 20 ст. выдадзены шэраг манаграфій па С. і культуры маст. слова (І.Я.Лепешаў, Т.П.Сцяшковіч, М.Я.Цікоцкі, Ф.М.Янкоўскі і інш.).

Літ.: Каўрус А.А. Стылістыка беларускай мовы. 2 выд. Мн., 1987; Булахов М.Г. Основные вопросы сопоставительной стилистики русского и белорусского языков. Мн., 1979; Юрэвіч А.К. Стылістыка беларускай мовы. Мн., 1983; Лепешаў І.Я. Праблемы фразеалагічнай стылістыкі і фразеалагічнай нормы. Мн., 1984; Цікоцкі М.Я. Стылістыка беларускай мовы. 2 выд. Мн., 1995.

М.Я.Цікоцкі.

СТЫЛІСТЫ́ЧНЫЯ ФІГУ́РЫ, сінтаксічныя фігуры, своеасаблівыя сінтаксічныя прыёмы будовы маст. мовы, якія адрозніваюцца ад агульнапрынятых у звычайнай моўнай практыцы сінтакс. норм. С.ф. разам з *рытарычнымі фігурамі* ўваходзяць у паэтычны сінтаксіс. Да С.ф. адносяцца розныя віды паўтораў (*анафара, эпіфара, градацыя, кальцо*, сімплака, падваенне, *бязлучнікавасць, шматлучнікавасць*, шматпрыназоўнікавасць), усе віды і формы парушэння сінтакс. ці лагічнай сувязі паміж словамі ўнутры вершаваных радкоў або празаічных фраз (*анакалуф, амфібалія, інверсія, эліпс*, умаўчанне), супастаўленне і проціпастаўленне гэтых радкоў, групоўка іх у пэўныя інтанацыйна-сінтакс. адзінствы (перанос, *паралелізм, антытэза, ампліфікацыя*, перыяд сінтаксічны). С.ф. індывідуалізуюць мову пісьменнікаў, надаюць ёй павышаную эмацыянальнасць. Канкрэтны ідэйна-маст. змест С.ф. выяўляецца толькі ў кантэксце маст. твора, залежыць ад яго жанру, творчай манеры аўтара.

А.А.Майсейчык.

СТЫЛІХО́Н (Stilicho) Флавій (каля 365 — 22.8.408), рымскі палкаводзец і дзярж. дзеяч. Па паходжанні вандал. Вызначыўся на ваен. і дыпламат. службе пры імператару *Феадосію I*. З 394 галоўнакамандуючы войскамі імперыі. Пасля смерці Феадосія I (395) прызначаны апекуном малалетняга імператара Ганорыя; фактычны правіцель Зах. Рым. імперыі ў 395—408. Вёў паспяховую барацьбу з варварамі ў Брытаніі, імкнуўся ўмацаваць межы па Рэйне і Дунаі. У 401 адбіў нападзенне вандалаў і аланаў. У 402—403 пад Паленцыяй і Веронай разбіў вестготаў на чале з *Аларыхам I*, у 406 — остготаў. Забіты ў Равене паводле загаду Ганорыя.

А.Г.Зельскі.

СТЫЛО́ (ад грэч. stylos), стыль, пісала, прыстасаванне для пісьма ў старажытнасці і сярэдневякоўі ў выглядзе стрыжня, завостранага на адным канцы і з лапатачкай на другім. На Русі вядомы з 10 ст. касцяныя, з 11 ст. металічныя (з жалеза ці бронзы). Вострым канцом С. пісалі на бяросце або на спец. дошчачцы — цэры. Лапатачкай разгладжвалі воск і сціралі напісанае. На Беларусі С. знойдзены ў Навагрудку, Ваўкавыску, Мінску, Брэсце, Полацку, Брасглаве, Слуцку, Тураве, Пінску, Копысі, Капылі і Друцку. Ужываліся да 15 ст.



Да арт. **Стыло**. Пісалы з Браслава і Друцка.

Насілі ў скураных футаралах, падвешаных да пояса. Жал. С. пакрывалі (лудзілі) волавам або меддзю. Стрыжні бронзавых С. амаль па ўсёй даўжыні перакручаны; лапаткі мелі форму кубачка (раннія), пяцівугольніка ці авала са зрэзаным верхам, перавернутага трохвугольніка (пазнейшыя). У аснове лапатачкі жал. С. было шарападобнае патаўшчэнне («яблык») або 2—3 валікі. Зрэдку лапатачка С. мела дэкор, а верхнюю частку касцяных аздаблялі выявамі жывёлы ці фантастычнай істоты.

Л.У.Калядзінскі.

СТЫЛЬ (лац. stilus, stylus ад грэч. stylos палачка для пісьма), устойлівае адзінства вобразнай сістэмы і сродкаў маст. выразнасці; форма маст. самавызначэння эпохі, рэгіёна, нацыі, сац. або творчай групы, асобнага творцы. Цесна звязаны з эстэт. самавыяўленнем, у шырокім сэнсе распаўсюджваецца на ўсе віды дзейнасці чалавека (С. жыцця, паводзін, адзення і інш.) і з'яўляецца адной з важных катэгорый *культуры*. Паняцце «С.» часта асацыіруецца з канкрэтнымі відамі творчасці і прымае іх гал. характарыстыкі (жывапісны або графічны, эпічны або лірычны і інш.), з рознымі сац.-быт. ўзроўнямі і функцыямі моўных зносін (афіцыйны, дзелавы, нефармальны, размоўны і інш.; гл. таксама *Стылістыка*). У мастацтве вызначэнне С. базіруецца на агульнасці характэрных прыкмет твора, што карэняцца ў сац.-гіст. умовах, светапоглядзе, светаадчуванні, *метадзе мастацкім* творцы, у агульных заканамернасцях маст.-гіст. працэсу.

У культурах стараж. цывілізацый С. быў цесна звязаны з *канонам*. У розныя гіст. перыяды С. спецыфічна разглядаўся ў розных відах мастацтва, дзе ў пэўнай ступені выяўляў свае тыповыя прыкметы ў суадносінах *зместу і формы*. Тэорыя С. як маст.-гіст. катэгорыі распрацавана ў канцы 19 — пач. 20 ст. Г.Вёльфлінам і А.Рыглем, якія абсалютызавалі тыпалагічныя прыкметы С., вызначалі яго як фармальную структуру і разглядалі яго змену як гал. прынцып гіст. развіцця мастацтва. У сучаснай тэрміналогіі паняцце «С.» мае вял. дыяпазон: вызначэнне сумы ўстойлівых прыкмет; якія характарызуюць вобразную і фармальную структуру мастацтва пэўнай гіст. эпохі [*раманскі стыль, готыка*, рэнесанс (гл. *Адраджэнне*), *барока, класіцызм, ракако, мадэрн*; у такім кантэксце С. таксама з'яўляецца адным з гал. элементаў *сінтэзу мастацтваў*]; вызначэнне маст. эпохі паводле храналагічных вех, пераважна дынастычных (напр., «С. Людовіка XIV» у Францыі, «віктарыянскі С.» у Англіі, «паўлаўскі С.» у Расіі); характарыстыка прыкмет групы помнікаў ці маст. кірунку ўнутры гіст. перыяду (геам. С. размалёвак стараж.-грэч. керамікі, *звярыны стыль, мяккі стыль* і інш.); вызначэнне маст. асаблівасцей пэўнага рэгіёна (напр., візант. С.); нац. С. (тэрмін, альтэрнатыўны паняццю нац. маст. *школа*), крытэрый якога — фарміраванне нац. класічкі, дзе закладваюцца асновы традыцый і стыліст. пераемнасці праз фалькл. вытокі, традыцыі нац. прафес. культуры і блізкіх, роднасных культур; вызначэнне індывідуальнай манеры творцы (напр., «С. Пусэна», «С. позняга Рэмбранта», «С. Бетховена», «С. Чайкоўскага», «С. Я.Коласа», «С. Я.Брыля»). З 17 ст. развіццё еўрап. мастацтва не ўкладваецца ў межы адзінага (т.зв. вялікага) С.: адначасова суіснавалі і знаходзіліся ў складанай узаемасувязі барока і класіцызм, з 18 ст. — позняе барока, класіцызм і ракако; творчасць буйнейшых прадстаўнікоў мастацтва (напр., Д.Веласкес, Рэмбрант, І.С.Бах, Вальтэр, Сімяон Полацкі) не ўкладваецца ў межы ніводнага С., хаця і ўзаемадзейнічае з імі. У 19—20 ст. стылістычнае адзінства знікае, развіццё мастацтва вызначаецца складанымі ўзаемаадносінамі маст. кірункаў і плыняў, якія маюць свае стылявыя прыкметы (*рамантызм, сентыменталізм, рэалізм, імпрэсіянізм, кубізм, абстракцыянізм, канструктывізм, сюррэалізм, сацыялістычны рэалізм, суровы стыль, постмадэрн* і інш.); узрастае роля С. творчай індывідуальнасці. Спроба стварэння ў канцы 19 — пач. 20 ст. адзінага С. мадэрн стала штуршком для пошукаў новых варыянтаў «сучаснага С.». У 20 ст. пашырылася тэндэнцыя да надання паняццю «С.» больш шырокага значэння — «С. эпохі» і вызначэння яго як сукупнасці агульных рыс, што адрозніваюць культуру адной гіст. эпохі ад другой.

Літ.: Лисса З. О сущности национального стиля: Пер. с нем. // Вопросы эстетики.

М., 1964. Вып. 6; Соколов А.Н. Теория стиля. М., 1968; Скребков С.С. Художественные принципы музыкальных стилей. М., 1973; Стыль пісьменніка. Мн., 1974; Михайлов М.К. Стиль в музыке. Л., 1981; Ломинадзе С.В. Концептуальный стиль и художественная целостность // Контекст, 1981. М., 1982; Бартенев И.А., Батажкова В.Н. Очерки истории архитектурных стилей. М., 1983; Медушевский В. К проблеме сущности, эволюции и типологии музыкальных стилей // Музыкальный современник. М., 1984. Вып. 5; Каплун А.И. Стиль и архитектура. М., 1985; Лосев А.Ф. Проблема художественного стиля. Киев, 1994; Ягож. Форма—Стиль—Выражение. М., 1995; Власов В.Г. Стили в искусстве: Словарь. Т. 1. СПб., 1995.

С.У.Пешын.

«СТЫЛЬ», «Дэ Стэйл» (гал. De Stijl), авангардысцкае аб'яднанне галандскіх архітэктараў і мастакоў у 1917—31 у г. Лейдэн на аснове аднайм. час. (1917—28). Прапагандавала тэорыю *неапластыцызму*. Прадстаўнікі «С.» стварылі ў жывапісе т.зв. геам. разнавіднасць абстрактнага мастацтва (П.*Мондрыян*, Т. ван *Дусбург*), а ў архітэктуры — строгія аскетычныя, матэматычна дакладныя па кампазіцыі пабудовы (арх. праекты Дусбурга, работы П.Аўда, Г.Рытвелда), якія набліжаліся да прынцыпаў *функцыяналізму*.

СТЫЛЬ (Stil) Андрэ (н. 1.4.1921, г. Эрны, Францыя), французскі пісьменнік. Скончыў ун-т у г. Ліль. Друкаваўся з 1949. Трылогія «Першы ўдар» (раманы «Каля воданапорнай вежы», 1951, Дзярж. прэмія СССР 1952; «Канец адной гарматы», 1952; «Парыж з намі», 1953) пра антываен. барацьбу франц. народа. У цыкле твораў «Пастаўлена пытанне аб шчасці» — раманах «Мы будзем любіць адно аднаго заўтра» (1957), «Абвал» (1960), «Апошняя чвэрць гадзіны» (1962), «Пойдзем танцаваць, Віяліна» (1964), «Андрэ» (1965), «Прыгожы, як чалавек» (1968), «Хто?» (1969), зб-ках апавяд. «Егіпецкі хлеб» (1956), «Боль» (1961) і інш. сац.-паліт. і маральна-этычныя праблемы, якіцё Францыі ў 2-ю сусв. вайну і пасляваен. гады. Аўтар раманаў «Раман-сон» (1976), «У люстэрку — сябар» (1977), «Бог — гэта дзіця» (1979), «Мілы доктар» (1980), літ.-крытычных і публіцыст. прац. Рэаліст. проза С. адметная дынамічным сюжэтам, выкарыстаннем дыялектаў, унутр. маналога. На бел. мову яго асобныя творы пераклалі Ю.Гаўрук, С.Дорскі.

Тв.: Бел. пер. — Любіць будзем заўтра. Мн., 1960; Салодкі пірог // Полымя. 1970. № 1; Пан Ванэс // Беларусь. 1974. № 3; Рус. пер. — Первый удар. Конец одной пушки. М., 1952; Вопрос о счастье поставлен. М., 1960; Мы будем любить друг друга завтра. Обвал. М., 1961; Боль. М., 1962; Он без ума от масла. М., 1965; Последние четверть часа. М., 1967; Пойдем танцевать, Виолина... М., 1973; Роман-сон. М., 1978; Повести. М., 1989.

Літ.: Наркирьер Ф. Французский роман наших дней. М., 1980; Андре Стиль: Биобиблиогр. бюл. М., 1952.

Е.А.Лявонава.

СТЫЛЬБ (ад грэч. stilbo зяю), адзінка яркасці ў *СГС сістэме адзінак*. Абазначаецца сб. 1 сб = 10^4 кд/м^2 = 3,14 *ламберта*. Гл. таксама *Кандэла*.

СТЫ́МУЛ (ад лац. stimulus, літар. — востраканцовы кій, якім паганялі жывёл), пабуджэнне, якое заахвочвае да дзейнасці, да ажыццяўлення чаго-н.; пабуджальная прычына паводзін.

СТЫ́МУЛ у псіхалогіі, уздзеянне, якое абумоўлівае дынаміку псіхічных станаў індывіда (*рэакцыю*). У псіхафізіялогіі, псіхафізіцы і фізіялогіі паняцце «С.» тоесна раздражненню. У *біхевіярызме* С. трактуецца механістычна: як змены асяроддзя, якія выклікаюць рухальныя адказы арганізма. Прадстаўнікі вюрцбургскай школы разглядалі С. як усведамленне індывідам мэты і задачы (О.Кюльпе, Н.Ах, К.Бюлер). Л.С.*Выгоцкі* вылучаў С.-аб'екты, на якія накіроўваецца дзеянне, і С.-сродкі, з дапамогай якіх гэта дзеянне ажыццяўляецца. У сац. псіхалогіі С. часам атаясамляецца з *матывам* як унутр. ці знешнім імпульсам, што выклікае актыўнасць індывіда.

СТЫМУЛЯ́ТАРЫ РО́СТУ, эндагенныя і экзагенныя рэчывы, што ўплываюць на рост і размнажэнне клетак. Эндагенныя С.р. — рэгулятары клетачнага цыкла, вызначаюць *рост*, *рэгенерацыю*, новаўтварэнні (*пухліны*) тканак або органаў. Іх уздзеянне адбываецца ў натуральных умовах і выклікаецца эксперыментальна. Да экзагенных фактараў адносяць сінт. прэпараты, рэчывы або фіз. агенты і інш. (гл. *Канцэрагены*). У жывёл і чалавека адрозніваюць гармоны, фактары росту, цытакіны (гл. *Роставыя рэчывы*); у раслін прыродныя — *аўксіны*, *гіберыліны*, *цытакініны* — і сінт. С.р. — індалілалейная або нафтылвоцатная к-та і інш. Гл. таксама *Рэгулятары росту раслін*.

СТЫПЕ́НДЫЯ (ад лац. stipendium плата), штомесячная грашовая дапамога, якая выдаецца студэнтам ВНУ (пры дзённай форме навучання), навучэнцам сярэдніх спец. навуч. устаноў, аспірантам і г.д. Студэнтам, аспірантам, якія дасягнулі асаблівых поспехаў у вучобе і н.-д. рабоце, назначаюцца павышаныя імянныя С. (устанаўліваюцца ў памяць выдатных дзеячаў дзяржавы, навукі, культуры).

СТЫП-ПОЙНТ (Steep Point), мыс на п-ве Ідэл-Ленд, самы зах. пункт мацерыка Аўстралія (113°05′ усх. д., 26°09′ паўд. ш.).

СТЫР, рака ў Львоўскай, Ровенскай і Валынскай абл. Украіны і ў Брэсцкай вобл. Беларусі, правы прыток р. Прыпяць. Даўж. 494 км, пл. вадазбору 12,9 тыс. км^2, на Беларусі адпаведна 70 км і каля 493 км^2. Пачынаецца на схілах узгорыстага масіву Варанякі ў межах Падольскага ўзв., цячэ па Палескай нізіне. Упадае ў р. Прыпяць 2 рукавамі: левы рукаў — р. Прастыр (даўж. 21 км), больш мнагаводны, вусце за 1,5 км на Пд ад в. Вял. Дзіковічы Пінскага р-на; правы рукаў (даўж. 70 км) упадае за 64 км ад вусця Прастыры ніжэй па цячэнні р. Прыпяць, за 1 км на ПдЗ ад в. Беразцы Столінскага р-на. Даліна трапецападобная, у верхнім цячэнні вузкая, глыбокаўрэзаная, шыр. 200—300 м, у ніжнім цячэнні зліваецца з далінай р. Прыпяць. Схілы ў верхнім цячэнні стромкія, выш. 30—40 м, у ніжнім спадзістыя. Пойма суцэльная, двухбаковая, у ніжнім цячэнні перасечаная старыцамі, шыр. да 2 км. Рэчышча сярэдне звілістае, у сярэднім цячэнні месцамі каналізаванае, шыр. ў верхнім цячэнні 2—10 м, у ніжнім разгалінаванае, шыр. 40—60 м. Берагі нізкія, месцамі абрывістыя. Асн. прытокі: Сланіўка, Іква, Канапелька, Кормін, Стубла 1-я на Украіне і Стубла 2-я на Беларусі (справа), Ліпа, Чарнагузка, Акінка (злева, усе на Украіне). У бас. С. каля 300 азёр агульнай пл. 26,2 км^2. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Ледастаў з канца снеж. — пач. студз. да сярэдзіны сакавіка. Веснавы ледаход 1—2 сут. С. вызначаецца інтэнсіўным разводдзем, на якое прыпадае каля 50% гадавога сцёку. Найвыш. ўзровень разводдзя ў ніжнім цячэнні ў пач. сак., сярэдняя выш. над межанным узроўнем 1,3—1,5 м. Сярэднегадавы расход вады каля г. Луцк 29 м^3/с, у ніжнім цячэнні 49,5 м^3/с. На С. вадасховішча, ГЭС, выкарыстоўваецца для тэхн. і быт. водазабеспячэння, арашэння с.-г. угоддзяў і як водапрыёмнік асушальных сістэм. Суднаходная ад г. Луцк (312 км ад вусця). На рацэ г. Луцк (Украіна).

А.А.Макарэвіч.



Рака **Стыр** каля в. Лапацін Пінскага раёна.

СТЫ́РЛІНГА ФО́РМУЛА, асімптатычная роўнасць, якая набліжана вызначае значэнні здабытку n першых натуральных лікаў пры вял. значэннях n. Паводле С.ф. $n! \approx \sqrt{2\pi}\, n^n e^{-n}$, дзе $n! = 1 \cdot 2 \cdot 3 \cdot \ldots \cdot n$, e — аснова натуральных лагарыфмаў. Напр., пры $n = 10$ С.ф. дае $n! \approx 3\,598\,700$, а дакладнае значэнне $n! = 3\,628\,800$ (адносная хібнасць менш за 1%). Прапанавана шатл. матэматыкам

Дж.Стырлінгам (1730) на аснове асімптатычнага раскладання лагарыфма гама-функцыі ў шэраг (шэраг Стырлінга). Выкарыстоўваецца ў тэорыі імавернасцей, матэм. статыстыцы, стат. фізіцы і інш.

СТЫРО́Л, вінілбензол, фенілэтылен, арганічнае злучэнне, араматычны алкен, $C_6H_5CH=CH_2$. Ёсць у стыраксе — араматычным *бальзаме*, што вылучаецца пры раненні ствалоў дрэў ліквідамбара, адсюль назва «С.» [грэч. styrax + лац. ol(eum) — алей].

Бясколерная вадкасць з саладкаватым пахам, шчыльн. 905,9 кг/м^3, $t_{кіп}$ 145 °С. Добра раствараецца ў этаноле, эфірах, вуглевадародах, растварае многія арган. рэчывы і палімеры. З вадой утварае азеатропную сумесь ($t_{кіп}$ 34,8 °С). Здольны да хуткай тэрмічнай полімерызацыі ў *полістырол*, лёгка суполімерызуецца з большасцю вінілавых суманамераў (гл. *АБС-пластык, Бутадыен-стырольныя каўчукі*). У прам-сці атрымліваюць пераважна каталітычнай дэгідрагенізацыяй *этылбензолу*. Выкарыстоўваюць як манамер у вытв-сці полістыролу, АБС-пластыкаў, бутадыен-стырольных каўчукаў, тэрмаэластапластаў, як рэакцыйназдольны растваральнік поліэфірных і мадыфікатар алкідных смол, для сінтэзу іонаабменных смол. Таксічны: раздражняе слізістыя абалонкі верхніх дыхальных шляхоў і вачэй, выклікае галаўны боль, пашкоджвае ц.н.с., ГДК 5 мг/м^3. *Я.Г.Міляшкевіч.*

СТЫРЫКО́ВІЧ Міхаіл Адольфавіч (3.11.1902, С.-Пецярбург — 27.10.1995), расійскі вучоны ў галіне цеплаэнергетыкі і цеплафізікі. Акад. АН СССР (1964, чл.-кар. 1946). Герой Сац. Працы (1972). Скончыў Ленінградскі тэхнал. ін-т (1927). У 1928—46 у Цэнтр. котлатурбінным ін-це, адначасова ў 1938—60 заг. лабараторыі Энергет. ін-та АН СССР. У 1961—66 заг. лабараторыі Ін-та высокіх т-р пры Маскоўскім энергет. ін-це. У 1964—88 акад.-сакратар, нам. акад.-сакратара Аддз. фіз.-тэхн. праблем энергетыкі АН СССР. Навук. працы па даследаванні цепласілавых агрэгатаў і рабочых працэсаў паравых катлоў, цепламасаабмене і прагназіраванні развіцця энергетыкі, па стварэнні норм цеплавога і аэрадынамічнага разлікаў кацельных агрэгатаў.

СТЫТЫ́ЧАВА, вёска ў Плешчыцкім с/с Пінскага р-на Брэсцкай вобл., каля р. Прыпяць. Цэнтр калгаса. За 6 км на Пд ад горада і чыг. ст. Пінск, 181 км ад Брэста. 659 ж., 231 двор (2001). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

СТЫХІ́ЙНЫЯ БЕ́ДСТВЫ, разбуральныя прыродныя з'явы і працэсы, якія наносяць вялікія матэрыяльныя страты і выклікаюць чалавечыя ахвяры. Могуць быць адлюстраваннем і вынікам працэсаў, якія адбываюцца ўнутры Зямлі (вывяржэнні *вулканаў*, *землетрасенні*), на яе паверхні (*апоўзні, лавіны, навадненні, селі*), у атмасферы (*буры, град, засуха, маланкі, смерчы, тайфуны, туманы, ураганы, шквалы*, познавясновыя і ранневосеньскія *замаразкі*, раптоўныя пахаладанні, незвычайныя маразы і інш.). У асобную групу вылучаюць нашэсці с.-г. і лясных шкоднікаў, *эпідэміі* і *эпізаотыі*. Як С.б. часта разглядаюць з'явы, якія маюць мясц. с.-г. значэнне і якія прыносяць гасп. страты толькі пры значнай працягласці (*вымаканне пасеваў, выправанне пасеваў*, працяглыя *дажджы*, асабліва ў час уборкі ўраджаю, *пажары*, залішняе ўвільгатненне, пад'ём узроўню падземных вод). Інтэнсіўнасць і вынікі С.б. нарастаюць пад уплывам нерацыянальнай гасп. дзейнасці чалавека і росту шчыльнасці насельніцтва. На Беларусі С.б. мясц. значэнні звязаны з познімі вясновымі і раннімі асеннімі замаразкамі, ліўнямі, навадненнямі, бурамі, смерчамі і інш.



М.А.**Стырыковіч**.



Дж.**Стэйнбек**.

СТЭАРЫ́Н (ад грэч. stear тлушч), сумесь стэарынавай і пальміцінавай кіслот з нязначнай (да 5%) колькасцю алеінавай і інш. ненасычаных кіслот. Паўпразрыстая бясколерная ці жаўтаватая маса ($t_{пл}$ 53—65 °С). Атрымліваюць прасаваннем і ахаладжэннем гідралізату жывёльных *тлушчаў*. Гл. таксама *Стэарынавая кіслата*.

СТЭАРЫ́НАВАЯ КІСЛАТА́, октадэканавая кіслата, насычаная вышэйшая *тлустая кіслата*, $CH_3(CH_2)_{16}COOH$. Пашырана ў прыродзе, у выглядзе *гліцэрыдаў* ёсць ва ўсіх жывёльных тлушчах і алеях.

Бясколерныя крышталі ($t_{пл}$ 69,6 °С), практычна нерастваральныя ў вадзе. С.к. ўтварае солі і эфіры — стэараты. Вылучаюць са *стэарыну*, чыстую С.к. (99,8%-ную) атрымліваюць гідрыраваннем *алеінавай кіслаты*. Выкарыстоўваюць С.к. для сінтэзу октадэцылавага спірту і октадэцыламіну, у аналіт. хіміі, фармацэўтычнай і касметычнай прам-сці (кампанент мазей і крэмаў), стэарын у вытв-сці свечак (у сумесі з парафінам), мыла, у папяровай, тэкст., гумавай прам-сці, эфіры С.к. як кампаненты антыаксідантаў, эмульсій для апрацоўкі скуры і тэкстылю, як стабілізатары харч. прадуктаў і інш. Гл. таксама *Мылы*.

СТЭ́ВЕН Хрысціян Хрысціянавіч (30.1.1781, г. Хаміна, Фінляндыя — 30.4.1863), расійскі вучоны ў галіне батанікі і энтамалогіі. Ганаровы чл. Пецярб. АН (1849; чл.-кар. 1815). Скончыў Медыка-хірург. акадэмію ў Пецярбургу (1799). У 1812 арганізаваў Нікіцкі батанічны сад у Крыме і быў яго дырэктарам да 1824. Навук. працы па флоры Крыма і Каўказа, сістэматыцы насенных раслін і насякомых.

СТЭГАЗА́ЎРЫ (Stegosauria), падатрад вымерлых паўзуноў атр. птушкатазавых *дыназаўраў*. 2 сям., каля 10 родаў, 23 віды. Вядомы ад юрскага да ніжнемелавога перыяду. Жылі ў Паўн. Амерыцы, Зах. Еўропе, Афрыцы.

Даўж. да 10 м, выш. да 2,5 м. Тулава масіўнае. Пярэдняя канечнасці карацейшыя за задняя. Чэрап нізкі і доўгі. Уздоўж спіны і хваста ў 2 рады буйныя парныя панцырныя пласціны і шыпы. Расліннаедныя.

СТЭГАЦЭФА́ЛЫ, панцырнагаловыя, покрыўначарапныя (Stegocephala), выкапнёвыя земнаводныя. Жылі ў палеазоі. Іх рэшткі знойдзены на ўсіх кантынентах. Паходзяць ад кісцяпёрых рыб, продкі *паўзуноў*. Да С. адносяць батрахазаўраў, вымерлыя атр. падкл. лепаспандыльных і лабірынтадонтаў. Былі водныя і наземныя; жылі ў балотах, лагунах, забалочаных лясах.

Даўж. цела ад 10 см да 3—4 м. Форма разнастайная. С. былі саламандра-, трытона-, і кракадзілападобныя. Тулава ўкрыта касцявымі шчыткамі, чэрап зверху — масіўнай касцявой пласцінай (адсюль 2-я і 3-я назвы). Мелі адтуліны для вачэй, ноздраў і цемяннога вока. Драпежнікі.

СТЭ́ЙНБЕК (Steinbeck) Джон Эрнст (27.2.1902, г. Салінас, ЗША — 20.12.1968), амерыканскі пісьменнік. Вучыўся ў Станфардскім ун-це. Шмат падарожнічаў, працаваў журналістам. У ранніх раманах «Залатая чаша» (1929), «Невядомаму богу» (1933), «Квартал Тартылья-Флэт» (1935), цыкле апавяд. «Райская паша» (1932), зб. навел «Доўгая даліна» (1938) рамант. тэндэнцыі. Сац. праблематыка ў рамане «Бітва з няпэўным зыходам» (1936) і аповесці «Пра мышэй і людзей» (1937). Вяршыня яго творчасці — раман «Гронкі гневу» (1939, экранізаваны ў 1940) пра лёс даведзеных да галечы фермераў, якія вандруюць па краіне ў пошуках працы; праз пакуты і нястачы героі ўсведамляюць сябе часцінкай абяздоленага народа. Ваен. і антыфаш. тэматыка ў кн. нарысаў «Бомбы ўніз» і аповесці «Месяц зайшоў» (абедзве 1942). У пасляваен. творчасці С. (раманы «Кансервавы рад», 1945; «Аўтобус, які заблудзіў», 1947; «Добры чацвер», 1954; аповесць «Жамчужына», 1947) вылучаецца філас. раман «На ўсходзе ад раю» (1952, экранізаваны ў 1955), у якім сцвярджаецца думка пра здольнасць чалавека перамагчы зло ў сабе і дасягнуць любых духоўных вышынь. Аўтар эпахальнага рамана «Зіма трывогі нашай» (1961), які ідэяй маральнага ўзвышэння чалавека спрыяў новаму ўздыму амер. л-ры. Кн. нарысаў «Падарожжа з Чарлі ў пошуках Амерыкі» (1962) — даследаванне маральна-грамадскага клімату ЗША. На бел. мову яго раман «Гронкі гневу» пераклаў С.Дорскі. Нобелеўская прэмія 1962.

Тв.: Бел. пер. — Гронкі гневу. Мн., 1993; Рус. пер. — Избр. произв. М., 1988; Собр. соч. Т. 1—6. М., 1989.

Літ.: Мулярчик А.С. Творчество Джона Стейнбека. М., 1963; Батурин С.С. Джон Стейнбек и традиции американской литературы. М., 1984. *Т.Я.Камароўская.*

СТЭ́ЙНБЕРГЕР, Штэйнбергер (Steinberger) Джэк (н. 25.5.1921, г. Бад-Кісінген, Германія), амерыканскі фізік-эксперыментатар. Чл. Нац. АН ЗША (1966), Гайдэльбергскай АН (1967), Амер. акадэміі мастацтваў і навук (1969). З 1934 у ЗША. Скончыў Чыкагскі (1942) і Калумбійскі (1948) ун-ты. З 1948 у Прынстанскім ін-це перспектыўных даследаванняў, з 1949 у Каліфарнійскім ун-це ў Берклі, у 1950—71 праф. Калумбійскага ун-та, з 1986 праф. Вышэйшай нармальнай школы ў г. Піза (Італія). Адначасова з 1968 у Еўрапейскім цэнтры ядз. даследаванняў (г. Жэнева, Швейцарыя). Навук. працы па фізіцы элементарных часціц. Вызначыў спін і цотнасць π -мезонаў, пацвердзіў існаванне нейтральнага піона (1950—52, разам з В.К.Г.*Панофскім*). Сумесна з інш. адкрыў Σ^- -гіперон (1956). Эксперыментальна даказаў існаванне двух розных тыпаў нейтрына — электроннага і мюоннага (1962, з Л.М.*Ледэрманам* і М.*Шварцам*). Нобелеўская прэмія 1988 (разам з Ледэрманам і Шварцам).

Тв.: Рус. пер. — Эксперименты с пучками нейтрино высоких энергий // Успехи физ. наук. 1990. Т. 160, вып. 10. *М.М.Касцюковіч.*

СТЭ́ЙНІЦ (Steinitz) Вільгельм (14.5.1836, Прага — 12.8.1900), шахматыст і шахматны тэарэтык. Вучыўся ў Венскім політэхн. ін-це. Распрацаваў шахматную тэорыю пазіцыйнай гульні. З 1862 у Вялікабрытаніі, з 1883 у ЗША. Першы чэмпіён свету па шахматах (1886—94). Пераможца ў матчах-турнірах з А.Андэрсенам (1866), М.Чыгорыным (1889, 1892), І.Гунсбергам (1890/91), Э.Шыферсам (1896) і ў міжнар. турнірах (1873, 1882, Вена; 1894, Нью-Йорк).

СТЭ́ЛА (ад грэч. stēlē слуп), вертыкальна пастаўленая надмагільная або мемар. пліта з каменю ці інш. даўгавечнага матэрыялу з надпісам ці рэльефнай выявай. Вядома з 6—5 ст. да н.э. У Стараж. Грэцыі С. служылі надмагіллямі, межавымі камянямі, увекавечвалі пэўныя падзеі. У сучасным мастацтве форму С. выкарыстоўваюць для надмагілляў і помнікаў інш. прызначэння, у буд-ве мемар. комплексаў (*Рыленкі, Хатынь*).

В.Ф.Валошын.

СТЭ́ЛА ў батаніцы, тое, што *цэнтральны цыліндр*.

СТЭЛА́Ж (ням. Stellage ад stellen ставіць), шмат'яруснае прыстасаванне для захоўвання розных рэчаў, размяшчэння матэрыялаў і вырабаў, якім неабходна сушка (торф, цэгла і інш.). Паводле прызначэння бываюць стацыянарныя, у выглядзе паліц (у кнігасховішчах, магазінах, на складах), перасоўныя, т.зв. вяртушкі (у аптэках), механізаваныя цялежкі, кантэйнеры і інш.







Дж.**Стэйнбергер**.

М.А.**Стэльмах**.

Я.М.**Стэльмах**.

СТЭ́ЛЕРАВА КАРО́ВА, млекакормячае атр. сірэн, гл. *Марская карова*.

СТЭ́ЛЬМАХ Міхаіл Апанасавіч (24.5.1912, с. Дзякаўцы Вінніцкай вобл., Украіна — 27.9.1983), украінскі пісьменнік. Герой Сац. Працы (1972). Акад. АН Украіны (1978). Скончыў Вінніцкі пед. ін-т (1933). Працаваў настаўнікам, у Ін-це мастацтвазнаўства, фальклору і этнаграфіі АН Украіны. Друкаваўся з 1936. Зб-кі вершаў «Добрая раніца» (1941), «За ясныя досвіткі», «Правесень» (абодва 1942), «Украіне вольнай жыць!» (1944), «Шляхі світання» (1948), «Жыта моцы набіраецца» (1954), зб. навел «Бярозавы сок» (1944). У трылогіі (раманы «Вялікая радня», 1949—51, Дзярж. прэмія СССР 1951; «Кроў людская — не вадзіца», 1957, экранізаваны ў 1960; «Хлеб і соль», 1959, Ленінская прэмія 1961, экранізаваны ў 1971) адлюстраваны гал. этапы жыцця ўкр. вёскі ў 20 ст. Аўтар раманаў «Дума пра цябе» (1962), «Чатыры броды» (1979, Дзярж. прэмія Украіны імя Т.Шаўчэнкі 1980). Проза С. вызначаецца псіхалагізмам, выразнасцю мовы, багаццем фальклю. і этнаграфічных дэталей. Аўтар п'ес «Залатая мяцеліца» (1955), «Праўда і крыўда» (паст. ў 1965 Бел. т-рам імя Я.Коласа), «На Івана Купалу» (1966), «Зачараваны вятрак» (1967), «Кум каралю» (1968), «Дума пра любоў» (1971); кн. для дзяцей «Каласок да каласка» (1951), «Заечая капуста» (1954), «Гусак-фізкультурнік» (1962). На ўкр. мову пераклаў некат. вершы Я.Купалы, А.Астрэйкі, П.Пестрака, М.Танка. На бел. мову творы С. перакладалі А.Васілевіч, В.Вітка, С.Грахоўскі, Х.Жычка, В.Зуёнак, М.Маляўка, Р.Няхай, П.Сушко.

Тв.: Твори. Т. 1—7. Київ, 1982—84; Бел. пер. — Над Чэрэмошам. Мн., 1955; Рус. пер. — Большая родня. М., 1975.

Літ.: Руденко-Десняк А. Верность герою. М., 1980. *І.М.Ключановіч.*

СТЭ́ЛЬМАХ Уладзімір Мацвеевіч (15.7.1910, в. Бушмічы Камянецкага р-на Брэсцкай вобл. — 27.1.1974), бел. тэатральны дзеяч, пісьменнік. Засл. дз. маст. Беларусі (1961). Скончыў студыю БДТ-2 (1930), Дзярж. ін-т тэатр. мастацтва ў Маскве (1954). Акцёр бел. трама (з 1930), т-ра юнага гледача імя Н.Крупскай (1937—41), дырэктар т-раў імя Я.Коласа (з 1943), оперы і балета Беларусі (з 1945), імя Я.Купалы (1947—51), рэсп. т-ра юнага гледача (1955—66). Характарны акцёр. З лепшых роляў: Косця-капітан («Арыстакраты» М.Пагодзіна), фельдфебель Мокры («Музыканцкая каманда» Д.Дэля) у траме; рабочы Розенц («Гады выпрабаванняў» К.Райманд), Пан («Цудоўная дудка» В.Вольскага) у т-ры юнага гледача. Аўтар п'ес «Шляхі» (паст. 1931), «Канец маскараду» (з Ю.Рудзько, паст. 1938) і інш. Аўтар кніг «Народны артыст СССР Г.П.Глебаў» (1954), «Шляхі беларускага тэатра» (1964), «Кранаючы чуткія струны душы» (1966), «Тэатр і час: Запіскі дырэктара тэатра» (1973), артыкулаў пра бел. т-р. Пераклаў на бел. мову «Хітрыкі Скапэна» Мальера (паст. 1940).

Літ.: Пятровіч С. Уладзімір Стэльмах // Майстры беларускай сцэны. Мн., 1986.

Дз.У.Стэльмах.

СТЭ́ЛЬМАХ Яўген Міхайлавіч (11.5.1923, в. Вязаўніца Асіповіцкага р-на Магілёўскай вобл. — 1.6.1951), Герой Сав. Саюза (1951). Скончыў Мінскі аэраклуб (1941), Чарнігаўскую ваен. авіяшколу лётчыкаў (1943). У Чырв. Арміі з 1941,



Стэла ў г. Капан у Гандурасе.

удзельнік Вял. Айч. вайны. У час *карэйскай вайны 1950—53* камандзір звяна ст. лейтэнант С. у паветр. баі збіў 2 бамбардзіроўшчыкі праціўніка, але і яго самалёт быў падбіты. С. прызямліўся на парашуце і загінуў у баі з дыверсійнай групай праціўніка.

Літ.: Герои Советского Союза: могилевчане. Мн., 1965. Лобов Г. В небе Северной Кореи // Авиация и космонавтика. 1991. № 3.

СТЭМФІ́ЛІУМ (Stemphylium), род недасканалых грыбоў сям. дэмацыевых. Каля 10 відаў. Пашыраны ў Еўразіі, Амерыцы, Афрыцы. На Беларусі 4 віды С.: паслёнавы (S. solani), сарцынападобны (S. sarciniforme), цыбулевы (S. allii), шматгронкавы (S. botryosum). Трапляюцца на расл. рэштках, насенні, спелых пладах, выклікаюць іх гніенне. Некат. факультатыўныя паразіты, узбуджальнікі плямістасці раслін (бульбы, канюшыны, лубіну і інш.).

Міцэлій септыраваны, развіваецца ў тканках або часткова на паверхні. *Канідыяносцы* дыферэнцыраваныя, адзіночныя ці ў выглядзе дзярнінак. *Канідыі* адзіночныя, верхавінкавыя, з папярочнымі і падоўжанымі перагародкамі або з некалькімі перацяжкамі.

С.І.Бельская.

СТЭН (ад грэч. sthenos сіла), адзінка сілы ў сістэме адзінак МТС (метр, тона, секунда). С. роўны сіле, якая масе ў 1 т надае паскарэнне 1 м/с^2. Абазначаецца сн. 1 сн = 10^3 Н. Гл. таксама *Ньютан*.

СТЭН (Steen) Ян (каля 1626, г. Лейдэн, Нідэрланды — пахаваны 3.2.1679), галандскі жывапісец. Вучыўся ў Н.Кнюпфера ва Утрэхце, А. ван Астадэ ў Харлеме і Я. ван Гоена ў Гаазе. Працаваў у Лейдэне, Гаазе, Дэлфце, Вармондзе, Харлеме. Пісаў партрэты, пейзажы, бібліейскія кампазіцыі, але аддаваў перавагу быт. жанру. Творы С. прасякнуты грубаватым, але добразычлівым нар. гумарам, вызначаюцца вастрынёй, часам сатыр. характарыстыкай персанажаў, назіральнасцю, займальнасцю апісальніцтва, майстэрствам у перадачы фігур, дэталей побыту і адзення: «Вясковае вяселле» (1653), «Хворая і доктар», «Гулякі» (каля 1660), «Птушыны двор» (1660), «Танцоры», «Сям'я мастака ў вясёлай кампаніі» (абодва каля 1663), «Гульня ў трык-трак» (1667).



Я.Стэн. Птушыны двор. 1660.

СТЭНА... (ад грэч. stenos вузкі, цесны), першая састаўная частка складаных слоў, якая адпавядае паняццям «цесны, абмежаваны», «скарочаны», напр., *стэнаграма, стэнатыпія, стэнакардыя*.

СТЭНАБА́ТНЫЯ АРГАНІ́ЗМЫ (ад *стэна*... + грэч. bathos глыбіня), водныя жывёлы з абмежаваным дыяпазонам верт. пашырэння, якія насяляюць толькі адну верт. зону мора (напр., літараль, батыяль, абісаль). Да іх належаць большасць донных марскіх жывёл (напр., паганафоры, глыбакаводныя рыбы). Процілегаюць *эўрыбатным арганізмам*.

СТЭНАБІЁНТЫ (ад *стэна*... + *біёнт*), арганізмы, якія існуюць у адносна пастаянных умовах навакольнага асяроддзя. Вылучаюць С. ў адносінах да т-ры (*стэнатэрмныя арганізмы*), салёнасці (*стэнагалінныя арганізмы*), гідрастатычнага ціску (*стэнабатныя арганізмы*), корму (*стэнафагі*), месца пражывання (*стэнатопныя арганізмы*) і інш. Да С. належаць паразіты і сімбіёнты, насельнікі марскіх глыбінь і пячор, вільготных трапічных лясоў. Высокая спецыялізаванасць С. вядзе да нізкай экалагічнай валентнасці і вузкіх арэалаў з высокай шчыльнасцю асобін. Процілегаюць *эўрыбіёнтам*.

СТЭНАГАЛІ́ННЫЯ АРГАНІ́ЗМЫ (*стэна*... + грэч. halinos салёны), арганізмы, здольныя існаваць пры невял. зменах салёнасці і хім. саставу асяроддзя. Напр., насельнікі салёных (медузы, селядцы, бычкі) і прэсных вадаёмаў (сцерлядзь, лінь, карась).

СТЭНАГРА́МА (ад *стэна*... + *...грама*), дакладны запіс прамовы, лекцыі, паказанняў сведкаў і інш. пры дапамозе *стэнаграфіі*.

СТЭНАГРАФІ́ЧНАЯ МАШЫ́НА, друкарская машына для *стэнаграфіі*. На ёй з дапамогай клавішаў вусная мова запісваецца на рухомую папяровую стужку звычайнымі літарамі і іх спалучэннямі (акордамі), а не стэнаграфічнымі знакамі. Скорасць запісу 120—150 слоў за мінуту. З развіццём *магнітнага запісу* і паяўленнем *дыктафонаў* С.м. страцілі сваё значэнне.

СТЭНАГРА́ФІЯ (ад *стэна*... + *...графія*), спосаб хуткага запісу вуснай мовы з дапамогай спец. сістэмы знакаў, скарачэння слоў і іх спалучэнняў; скарапіснае пісьмо. Хуткасць стэнаграфічнага пісьма перавышае хуткасць звычайнага ў 4—7 разоў.

С. вядома са стараж. часоў (Стараж. Грэцыя — 4 ст. да н.э., Стараж. Рым — 1 ст. да н.э.). У С. адрозніваюць курсіўныя (графічныя) і геаметральныя сістэмы (склаліся ў Англіі; тэрмін «С.» ўвёў у 1602 Дж.Уіліс у кн. «Мастацтва скарапісу, або Стэнаграфія»). Знакі курсіўных сістэм складаюцца з элементаў звычайнага пісьма, якія злучаюцца валасяной лініяй, а геаметральных сістэм (для моў з адносна кароткімі словамі) — з геам. фігур і іх частак у спалучэнні з прамой рознага нахілу, злучэнне непасрэднае, без валасяной лініі. Сістэмы С. адрозніваюцца і прыёмамі скарачэння. У марфал. (каранёвай) сістэме С. прытрымліваюцца арфаграфіі звычайнага пісьма, словы скарачаюць пач. літарамі. У фанет. (слыхавой) сістэме пры скарачэнні выкідваюць невыразныя гукі. У Расіі ў 1933 на аснове параўнання 7 лепшых сістэм С. прынята адзіная дзярж. сістэма С., у аснове якой сістэма М.М.Сакалова. Яна была прынята і ва ўсіх рэспубліках СССР (для рус. мовы). З некат. ўдакладненнямі яна выкарыстоўваецца ў наш час. Існуе і запіс на стэнаграфічных машынах.

А.Я.Міхневіч.

СТЭНАКАРДЫ́Я (ад *стэна*... + грэч. kardia сэрца), грудная жаба, прыступ рэзкага болю ў вобласці сэрца пры парушэнні кровазабеспячэння сардэчнай мышцы; найб. пашыраная форма *ішэмічнай хваробы сэрца*. Абумоўлена спазмамі вянечных сасудаў сэрца. Адрозніваюць С. напружання (боль пры значных фіз. нагрузках, хваляванні і інш.), спакою (у час сну), стабільную, прагрэсіруючую і інш. Прыкметы: скурнае покрыва бледнае, павелічэнне артэрыяльнага ціску крыві, раптоўныя болі ў левай палавіне грудной клеткі або ў цэнтры з распаўсюджваннем ў левую руку або плячо. Лячэнне тэрапеўтычнае.

СТЭНАТО́ПНЫЯ АРГАНІ́ЗМЫ (ад *стэна*... + грэч. topos месца), арганізмы, якія жывуць у месцах са спецыфічнымі, вельмі абмежаванымі ўмовамі асяроддзя. Найб. моцна пакутуюць ад знішчэння іх месцаў пражывання, часцей выміраюць. На Беларусі да С.а. належаць расліны сфагнавых балот (багун балотны, расіцы, журавіны) і пясчаных глеб (скочкі, расходнік едкі, асака пясчаная), з жывёл — палятуха звычайная, рабчык і крыжадзюбы (насельнікі хвойных лясоў), берагавая ластаўка і зімародак (жывуць на стромкіх берагах) і інш. Процілегаюць *эўрытопным арганізмам*.

СТЭНАТЫ́ПІЯ (ад *стэна*... + грэч. typos адбітак), пісьмо на спец. стэнаграфічнай пішучай машынцы, якая друкуе склады і цэлыя словы. Гл. таксама *Стэнаграфія, Стэнаграма*.

СТЭНАТЭ́РМНЫЯ АРГАНІ́ЗМЫ (ад *стэна*... + грэч. thermē цяпло), арганізмы, якія існуюць толькі пры пэўных пастаянных тэмпературных умовах. Адрозніваюць тэрмафілаў — цеплалюбівыя формы (рыфаўтваральныя каралы, насякомыя, большасць амфібій і рэптыліў, трапічныя расліны) і крыя-

ф і л а ў — холадалюбівыя формы (арктычныя ракападобныя, ласасёвыя рыбы, цюлені, белы мядзведзь, кустовая бяроза, некат. вербы, імхі, лішайнікі). Проціпастаўляюць *эўрытэрмным арганізмам*.

СТЭНАФА́ГІ (ад *стэна...* + грэч. phagein пажыраць), арганізмы, якія жывяцца адным ці нешматлікімі відамі корму, блізкімі паводле саставу. Характарызуюцца анат., фізіял. і біяхім. адаптацыямі (напр., спецыфічнай будовай стрававальнай сістэмы, асаблівымі ферментамі). Ступень стэнафагіі можа мяняцца з узростам — дарослыя асобіны спажываюць больш разнастайны корм, чым маладняк. Спецыялізацыя жыўлення ў С. садзейнічае аслабленню іх канкурэнцыі з інш. відамі, пры памяншэнні кармавой базы іх колькасць можа рэзка зніжацца.

Сярод С. шмат беспазваночных жывёл, асабліва насякомых, напр., многія клапы, перапончатакрылыя і матылі існуюць за кошт сокаў, нектару і пылку абмежаванай колькасці відаў раслін; яблыневыя пладажэркі жывуць у асн. на яблынях і дрэвах грэцкага арэху, каларадскі жук — пераважна на бульбе. Сярод пазваночных С. трапляюцца радзей, з рыб — сігі, сінец (кормяцца пераважна планктонам), сазан, лешч, лінь (заабентасам) і інш. У птушак спецыялізаванае жыўленне характэрна для чарацянак (пераважна аўсянкамі і камарамі-хіранамідамі), крыжадзюбаў (насеннем хваёвых дрэў) і скапы (рыбай). З млекакормячых да С. належаць лятучыя мышы (кормяцца пераважна начнымі насякомымі). Проціпастаўляюць *эўрыфагам*.

СТЭ́НБЕРГІ Уладзімір Аўгуставіч (4.4.1899—1982) і Георгій Аўгуставіч (20.10.1900—14.10.1933), расійскія графікі, дызайнеры, мастакі афармленчага мастацтва, тэатр. мастакі, браты. Нарадзіліся ў Маскве. Вучыліся ў Строганаўскім маст.-прамысл. вучылішчы (1912—17) і Свабодных маст. майстэрнях (1917—20). У пач. 1920-х г. удзельнічалі ў афармленні масавых свят. Прадстаўнікі *канструктывізму*. Удзельнікі руху вытв. мастацтва, адны са стваральнікаў сав. кінаплаката, якім уласцівы суадносіны дынамікі і мантажнага прынцыпу фільма, спалучэнне перамалёўкі эфектнага кадра з буйнымі каляровымі плоскасцямі і кідкім шрыфтам. Творы: афармленні спектакля «Опера жабракоў» Б.Брэхта і К.Вейля ў Маскоўскім Камерным т-ры, інтэр'еraў Палаца культуры аўтазавода (абодва 1930) у Маскве, святочнае афармленне Краснай плошчы (1928—34). У.Стэнберг выканаў афармленне выстаўкі «Нашы дасягненні» (з Л.Стэнберг, 1934), святочнае афармленне Краснай плошчы (1945, 1947—62, з С.Стэнбергам) і інш.

СТЭНД (англ. stand ад to stand стаяць, ставіць, змяшчаць), 1) шчыт, на якім выстаўляюцца экспанаты, размяшчаюцца дыяграмы, картаграмы, аб'явы для агляду (у музеі, на выстаўцы і да т.п.). 2) Устаноўка для зборкі і выпрабавання прылад, машын і механізмаў. 3) Спец. абсталяваная спарт. пляцоўка для стральбы з гладкаствольнай зброі.

СТЭНДА́ЛЬ [Stendhal; сапр. Б е й л ь (Beyle) Анры Мары; 23.1.1783, г. Грэнобль, Францыя — 23.3.1842], французскі пісьменнік; пачынальнік класічнага рэалізму. Скончыў грэнобльскую Цэнтр. школу (1799). У 1800—02, 1805—14 служыў у напалеонаўскай арміі, удзельнічаў у паходзе Напалеона на Маскву. У 1814—21 жыў у Італіі. На



Стэндаль.



У.М.Стэнлі.

светапогляд С. паўплывала матэрыялістычная філасофія франц. асветнікаў. Друкаваўся з 1815. Першыя творы прысвяціў музыцы («Жыццё Гайдна, Моцарта і Метастазіо», 1817; «Жыццё Расіні», 1824). Свае эстэт. погляды выклаў у кн. «Гісторыя жывапісу ў Італіі» (1817), трактатах «Пра каханне» (1822) і «Расін і Шэкспір» (1823—25), арт. «Вальтэр Скот і «Прынцэса Клеўская» (1830). Ён адзначаў, што л-ра павінна выяўляць свой час, праўдзіва і натуральна адлюстроўваць чалавека, аналізаваць яго ўнутр. свет, дыялектыку пачуццяў, абумоўленых фіз. і духоўным складам асобы, якая залежыць ад асяроддзя, выхавання і грамадскіх умоў быцця. Гэтыя прынцыпы С. рэалізаваў у створаным ім жанры сац.-псіхал. рамана, першым вопытам якога стаў раман «Арманс» (1827). У раманах «Чырвонае і чорнае» (1830, неаднаразова экранізаваны), «Люсьен Левен» (апубл. 1894, незавершаны) гісторыя духоўнага развіцця маладой асобы і аналіз розных слаёў франц. грамадства. Блізкая С. італьян. тэма — тэма страсці, чалавечай актыўнасці і самаахвяравання ў рамане «Пармскі манастыр» (1839) і зб. навел «Італьянскія хронікі» (апубл. 1855). Аўтар дарожных нататак «Рым, Неапаль і Фларэнцыя» (1817), «Прагулкі па Рыме» (1829), «Запіскі турыста» (1838), аўтабіягр. твораў «Успаміны эгатыста» (апубл. 1892), «Жыццё Анры Брулара» (апубл. 1890), рамана «Лам'ель» (апубл. 1889, незавершаны) і інш.

Тв.: Рус. пер. — Собр. соч. Т. 1—12. М., 1978.

Літ.: В и н о г р а д о в А.К. Стендаль и его время. 2 изд. М., 1960; Р е и з о в Б.Г. Стендаль: Худож. творчество. Л., 1978; Т и м а ш е в а О.В. Стендаль. М., 1983; Стендаль: Библиогр. рус. переводов и критич. лит. на рус. яз. [Ч. 1—2]. М., 1961—95.

С.Дз.Малюковіч.

СТЭ́НДЭР-ПЕ́ТЭРСЕН (Stender-Petersen) Адольф (21.7.1893, С.-Пецярбург — 16.4.1963), дацкі славіст. Чл. Польскай АН (з 1962). Вучыўся ў Пецярбургскім ун-це. З 1923 праф. Тартускага ун-та, з 1931 — ун-та ў Орхусе (з 1941 заг. кафедры славістыкі). Заснавальнік Т-ва сканд. славістаў (1951). У 1954—63 рэдактар час. «Scando-Slavica» («Скандаславіка»). Даследаванні ў галіне славяна-германскіх запазычанняў, рус. мовы. Аўтар прац пра польскі т-р, рус. класічную л-ру. У «Гісторыі рускай літаратуры» (ч. 1—3, 1952), імкнучыся раскрыць заканамернасці літ. працэсу, аналізаваў форму і стыль, прыцягваў сацыялагічныя звесткі.

СТЭ́НЛІ (Stanley) Генры Мортан [сапр. Р о ў л е н д с (Rowlands) Джон; 28.1.1841, г. Дэнбі, Вялікабрытанія — 10.5.1904], англійскі падарожнік і журналіст, даследчык Афрыкі. Як карэспандэнт амер. газеты ў 1871—72 адправіўся на пошукі Д.*Лівінгстана* і разам з ім даследаваў воз. Танганьіка. У 1874—77 перасек Афрыку з У на З да вусця р. Конга; вызначыў абрысы воз. Вікторыя, адкрыў азёры Джордж і Эдуард, горны масіў Рувензоры, даследаваў р. Кагера; дасягнуў вярхоўяў р. Луалаба (удакладніў, што яна з'яўляецца вытокам р. Конга), спусціўся па р. Конга да вусця і пазначыў на карце яе сярэднюю частку. У 1879—84 па даручэнні бельг. караля прымаў удзел у захопе зямель у бас. р. Конга, адначасова адкрыў азёры Маі-Ндомбе і Тумба. У 1887—89 кіраваў англ. экспедыцыяй, якая перасекла Афрыку з З на У, даследаваў р. Арувімі, выявіў, што воз. Эдуард належыць да сістэмы р. Ніл. Яго імем названы вадаспады на р. Конга (з 1983 — Баёма).

СТЭ́НЛІ (Stanley) Уэндэл Мерэдыт (16.8.1904, г. Рыджвіл, штат Індыяна, ЗША — 15.6.1971), амерыканскі вучоны ў галіне вірусалогіі і біяхіміі; адзін з заснавальнікаў *вірусалогіі*. Чл. Нац. АН ЗША (1941), Амер. акадэміі мастацтваў і навук (1949). Скончыў Эрлемскі каледж у Рычмандзе (1926) і Ілінойскі ун-т ва Урбане (1929). З 1929 у Ілінойскім, з 1930 у Мюнхенскім ун-тах, з 1931 у Ракфелераўскім ін-це мед. даследаванняў (Нью-Йорк), з 1932 у Ракфелераўскім ін-це ў Прынстане, з 1948 праф. Каліфарнійскага ун-та ў Берклі. Навук. працы па хіміі, рэпрадукцыі і зменлівасці вірусаў. Вылучыў у крышт. выглядзе вірус мазаікі тытуню (1935), вірус поліяміэліту (1955). Нобелеўская прэмія 1946 (з Дж.Х.*Нортрапам*).

СТЭ́НЛІ ВАДАСПА́ДЫ, назва вадаспадаў *Баёма* на р. Конга ў Дэмакратычнай Рэспубліцы Конга да 1983.

СТЭНЛІВІ́ЛЬ (Stanleyville), назва г. *Кісангані* ў Дэмакратычнай Рэспубліцы Конга да 1966.

СТЭ́НМАРК (Stenmark) Інгемар (н. 18.3.1956, Іосешэ, Швецыя), шведскі спартсмен (гарналыжны спорт). Чэмпіён XIII зімовых Алімп. гульняў (1980,

г. Лейк-Плэсід, ЗША) у слаламе і слаламе-гіганце, бронз. прызёр XII Алімп. гульняў (1976, г. Інсбрук, Аўстрыя) у слаламе-гіганце. Чэмпіён свету ў слаламе і слаламе-гіганце (1976) і ў слаламе (1982).

СТЭНО́З (ад грэч. stenōsis звужэнне), звужэнне фізіял. адтуліны (напр., перадсэрдзева-жалудачкавай) або трубчастага органа (напр., прываротніка страўніка — *піларастэноз*, кішкі, трахеі і інш.). Бывае несапраўдны, пры якім звужэнне прасвета органа абумоўлена сціскannем яго звонку, і сапраўдны (змены ў сценках органа). Сапраўдныя С. падзяляюцца на прыроджаныя (заганы развіцця) і набытыя (напр., рубцы пасля запаленчых працэсаў, язваў і інш.).

СТЭ́НТАРЫ, род раснічных інфузорый, гл. *Трубачы*.

СТЭП, занальны тып ландшафту, прадстаўлены травяністай ксерафітнай і мезаксерафітнай расліннасцю. Для С. характэрны згуртаванні дзернавінных злакаў (кавылі, танканог, ціпчак і інш.) і разнатраўя на чарназёмных і каштанавых глебах. У залежнасці ад іх суадносін адрозніваюць С.: с а п р а ў д н ы я (тыповыя) з пераважаннем дзернавінных злакаў, л у г а в ы я (лугастэпы), або разнатраўныя; п у с т ы н н ы я (апустыненыя) з вял. колькасцю пустынных паўкусцікавых (пераважна палыну), эфемераў і эфемероідаў. У Паўн. Амерыцы С. наз. *прэрыі*, ў Паўд. Амерыцы — *пампы*. Жывёльны свет С. вельмі разнастайны і адрозніваецца на розных кантынентах (напр., у Еўразіі пашыраны капытныя, грызуны, паўзуны і інш., у Аўстраліі — сумчатыя). Жывёльны і расл. свет С. мяняецца ў сувязі з гасп. дзейнасцю чалавека. Пашыраюцца эразійныя і інш. небяспечныя працэсы. Прыродныя С. захаваліся ў запаведніках і месцах, маладасягальных для чалавека (горы, міжгорныя катлавіны і інш.). *В.С.Аношка.*

СТЭ́ПАВАЯ ЗЕ́БРА, млекакормячае роду коней, гл. *Квага*.

СТЭ́ПАВЫЯ ЗО́НЫ, прыродныя геагр. зоны ўмераных і субтрапічных паясоў Паўн. і Паўд. паўшар'яў з пераважаннем у ландшафтах *стэпаў*. Размешчаны ў Еўразіі, Паўн. і Паўд. Амерыцы, Аўстраліі. Натуральныя ландшафты С.з., дзе пераважала стэпавая травяністая расліннасць, амаль зніклі (б.ч. тэрыторыі С.з. ўмеранага пояса разарана, у субтрапічным поясе пашыраны арашальнае земляробства і пашавая жывёлагадоўля). Клімат засушлівы (выпаральнасць на 300—500 мм перавышае гадавую суму ападкаў), з няўстойлівым увільгатненнем, з перапынкам (ва ўмераным поясе) або запавольваннем (у субтрапічным поясе) вегетацыі раслін зімой. Лета гарачае (т-ра паветра 20—25 °С), моцныя вятры, засухі. Ва ўмераным поясе зімой сярэднія т-ры паветра адмоўныя (месцамі ніжэй за -20 °С), утвараецца ўстойлівае снегавое покрыва; у субтрапічным поясе зіма мяккая, бясснежная, з дадатнымі т-рамі (вышэй за 5 °С). Ападкаў 200—450 мм за год, да 600 мм у субтрапічным поясе. Велічыня сонечнай радыяцыі на паверхні 500—580 кДж/см^2 (120—140 ккал/см^2) за год, да 790 кДж/см^2 (140—180 ккал/см^2) у субтрапічным поясе. Паверхневы сцёк нязначны, рэкі малаводныя, часта перасыхаюць. Захавана натуральная расліннасць — засуха- і марозаўстойлівыя травяністыя расліны з пераважаннем дзернавінных злакаў, участкі кусцікавых, па далінах рэк галерэйныя лясы. Глебы пладародныя (чарназёмы, цёмна-каштанавыя і каштанавыя ва ўмераным поясе, карычневыя і шэра-карычневыя, месцамі засоленыя — у субтрапічным). На разараных тэрыторыях пашырана эрозія глеб. У гарах няпоўны аналаг С.з. — стэпавыя вышынныя паясы. Прыродныя ўмовы і клімат спрыяльныя для жыцця людзей. У сельскай гаспадарцы С.з. пераважае вырошчванне збожжавых і тэхн. культур; развіта жывёлагадоўля. Пра расл. і жывёльны свет гл. ў арт. *Стэп*. *В.С.Аношка.*

СТЭ́ПАВЫЯ СПО́ДКІ, з а п а д з і н ы, акруглыя, амаль плоскія паніжэнні рэльефу ў стэпавай і лесастэпавай зонах. Дыяметр дзесяткі, радзей сотні метраў, глыб. да некалькіх метраў. Трапляюцца на раўнінных водападзелах і верхніх рачных тэрасах, па адным і групамі. Паводле паходжання вылучаюць С.с. дэфляцыйныя і карстава-суфазійныя. Расліннасць лугавая ці балотная, па краях травяністыя бярозавыя згуртаванні, на дне часам утвараюцца вадаёмы ці балоты.

СТЭРАДЫ́ЯН (ад грэч. stereos цялесны, прасторавы + *радыян*), адзінка *цялеснага вугла* ў СІ. Адносіцца да дадатковых адзінак гэтай сістэмы. Абазначаецца ср. С. роўны цялесному вуглу з вяршыняй у цэнтры сферы, які выразае на яе паверхні плошчу, роўную квадрату радыуса сферы. Поўная сфера ўтварае цялесны вугал, роўны 4π ср. С. выкарыстоўваецца ў святлатэхніцы пры тэарэт. разліках.

СТЭРКУ́ЛІЯ (Sterculia), род кветкавых раслін сям. стэркуліевых. Каля 100 (паводле інш. звестак каля 300) відаў. Пашыраны ў тропіках, пераважна Азіі і Афрыкі. Як дэкар. расліну культывуюць С. платаналістую (S. platanifolia).

Вечназялёныя лістападныя дрэвы выш. да 30 м. Лісце чаргаванае, простае ці складанае. Кветкі часта з непрыемным пахам, дробныя, часам буйныя, зеленаватыя, ярка-чырв., у мяцёлчатых суквеццях. Плод — лістоўка. Драўніну С. платаналістай выкарыстоўваюць для вырабу паперы, насенне — сурагат кавы. У многіх відаў насенне і маладыя карані ядомыя, са сцёблаў атрымліваюць *камедзі*, валокны для вяровак і інш. Лек., харч., тэхн., кармавыя, дэкар. расліны. *І.М.Гарановіч.*

СТЭ́РЛІНГАВАЯ ЗО́НА, група краін (у асн. б. брытанскія калоніі), якія раней прывязвалі курсы сваіх нац. валют да курса брытанскага фунта стэрлінгаў, а ў наш час выкарыстоўваюць стэрлінг у якасці міжнар. валютных рэзерваў.

СТЭРЛІТАМА́К, горад у Башкортастане (Расійская Федэрацыя), прыстань на р. Белая (бас. Волгі). Засн. ў 1766, горад з 1783, у 1919—22 — сталіца Башкірскай АССР. 265 тыс. ж. (2000), чыг. ст., вузел аўтадарог. Прам-сць: хім. (ВА «Каўстык» і «Сода», з-ды нафтахім. і сінт. каўчуку), маш.-буд. і металаапр. (станкі, буд. машыны, абсталяванне для нафтавай прам-сці), гарбарна-абутковая, швейная. Тэатр. Краязнаўчы музей.

СТЭРН (Sterne) Лорэнс (24.11.1713, г. Кланмел, Ірландыя — 18.3.1768), англійскі пісьменнік; прадстаўнік *сентыменталізму*. Скончыў багаслоўскі ф-т Кембрыджскага ун-та (1738); святар. Вядомасць прынеслі раманы «Жыццё і меркаванні Трыстрама Шэндзі, джэнтльмена» (т. 1—9, 1760—67) і «Сентыментальнае падарожжа па Францыі і Італіі» (1768), напісаныя ў рэчышчы змешанай паэтыкі сентыменталізму і ракако. Гульня рэальнасці і вымыслу, персаніфікацыя вобраза чытача, натуральнасць кампазіцыі, геданізм, ігравыя прыёмы, спалучэнне філас. разважанняў і аўтарскай іроніі, глабальных праблем і кур'ёзных дробязей, высокага і нізкага ставяць гэтыя творы ў лік значных з'яў у гісторыі л-ры, што істотна паўплывалі на пошукі л-ры 20 ст. — мадэрнізму (асабліва *плыні свядомасці*) і постмадэрнізму.

Тв.: Рус. пер. — Жизнь и мнения Тристрама Шенди, джентльмена. М., СПб., 2000; Сентиментальное путешествие. Воспоминания. Письма. Дневник для Элизы. М.; СПб., 2000. *Н.У.Дзешкавец.*

СТЭРО́ІДЫ, клас біялагічна важных прыродных злучэнняў, у аснове структуры якіх ляжыць шкілет насычанага *вуглевадарода* цыклапентанпергідрафенантрэна. Пашыраны ў прыродзе. Асн. кірунак біяхім. эвалюцыі С. — іх спецыялізацыя ў якасці біял. рэгулятараў. Падзяляюць на *стэрыны*, вітаміны групы D, *жоўцевыя кіслоты* і спірты, стэроідныя *алкалоіды* (напр., галарымін), стэроідныя сапаніны (напр., дыгітанін), стэроідныя *гармоны* (*андрагены, кортыкастэроіды, эстрагены*), *сардэчныя гліказіды* (напр., страфанцін).

Здольнасць да біясінтэзу С. найб. выяўлена ў вышэйшых пазваночных. Насякомыя атрымліваюць С. з кормам (не выпрацоўваюць). Палавое размнажэнне некат. ніжэйшых грыбоў індуцыруецца таксама С. Прыгнечванне біясінтэзу С. парушае цвіценне вышэйшых раслін. С. вылучаюць са спіннога мозга і жоўці буйн. раг. жывёлы, шчолачнага гідралізату дражджэй, адходаў цэлюлозна-папяровай прам-сці. Выкарыстоўваюць гал. чынам у медыцыне (лек. сродкі, гармоны і інш.).

СТЭРЫЛІЗА́ЦЫЯ (ад лац. sterilis бясплодны), 1) знішчэнне мікраарганізмаў і іх спор. Ажыццяўляецца фіз. (кіпячэнне, праправанне сухой парай, парай пад ціскам, ультрафіялетавае і іанізавальнае выпрамяненне, ультрагук), хім. (апра-

цоўка газападобнымі рэчывамі і растворамі хім. прэпаратаў) метадамі, з дапамогай бактэрыяльных фільтраў. Робіцца з мэтай прадухілення занесу мікраарганізмаў у арганізм чалавека і жывёл, недапушчэння мікробнага разбурэння розных матэрыялаў (харч., лек.), выключэння мікробнага забруджвання пры мікрабіял. даследаваннях і інш. У медыцыне і ветэрынарыі стэрылізуюць перавязачныя і шыўныя матэрыялы, дыягнастычнае і лек. абсталяванне, пажыўныя асяроддзі, посуд і інш. Пашырана таксама ў мікрабіялогіі, харч. прам-сці (разам з *пастэрызацыяй*). 2) С. п а л а в а я — уздзеянне на арганізм чалавека або жывёлы з мэтай пазбаўлення здольнасці аднаўлення патомства пры захаванні эндакрыннай функцыі палавых залоз. Гл. таксама *Стэрыльнасць*.

Э.А.Вальчук.

СТЭРЫ́ЛЬНАСЦЬ у б і я л о г і і, нездольнасць арганізма ўтвараць *гаметы* або дастатковую іх колькасць, што прыводзіць да зніжэння пладавітасці (колькасці патомкаў). Пры поўнай С. гаметы не ўтвараюцца наогул ці амаль усе анамальныя, пры частковай фарміруюцца пэўныя долі анамальных гамет. Спадчынная С. бывае генная (абумоўлена геннымі мутацыямі, якія парушаюць *меёз* — асн. звяно *гаметагенезу*), храмасомная (выклікаецца храмасомнымі перабудовамі), геномная (звязана з колькаснымі зменамі храмасомнага набору; гл. *Анеўплаідыя, Поліплаідыя*). Да спадчыннай С. адносяцца выпадкі міжвідавых гібрыдаў. Гаметная С. звязана з анамаліямі і гібеллю гамет, зіготная — абумоўлена парушэннямі функцыянавання палавых залоз і самых ранніх этапаў гаметагенезу; можа выклікацца фактарамі навакольнага асяроддзя (выпрамяненні, павышэнне т-ры асяроддзя і інш.). С., характэрная для пэўных перыядаў жыцця, наз. ўзроставай. Адзнака С. падвяргаецца ўздзеянню *натуральнага адбору* (выклікае зніжэнне пладавітасці і з генафонду папуляцый элімініруюцца генет. фактары, якія яе выклікаюць). Адбор таксама падтрымлівае фактары, што абумоўліваюць міжвідавую С. і забяспечваюць генет. ізаляцыю паміж папуляцыямі розных відаў арганізмаў. У чалавека і жывёл С. наз. бясплоднасцю. У м е д ы ц ы н е і м і к р а б і я л о г і і С. наз. таксама адсутнасць у асяроддзі, арганізме або ў якім-н. матэрыяле мікраарганізмаў ці іх спораў.

А.С.Леанцюк.

СТЭРЫ́ЛЬНЫЯ МІЦЭ́ЛІІ (Mycelia sterilia), група грыбоў, аб'яднаных па характэрнай прыкмеце — адсутнасці споранашэння. Найб. вядомыя роды *рызактонія* і склеротый. Паразітуюць на с.-г. і дзікарослых раслінах.

У цыкле развіцця адзначаны *міцэлій, склероцыі* і клеткі накшталт *хламідыяспораў*. Міцэлій паверхневы, галінасты, павуціністы або лямцавы. Цёмнаафарбаваныя склероцыі рознай формы і памераў. Большасць відаў звычайна зімуе на стадыі склероцыяў, якія вясной прарастаюць у міцэлій і заражаюць новыя расліны.

С.І.Бельская.

СТЭРЫ́НЫ, с т э р о л ы, тэтрацыклічныя спірты класаў трытэрпеноідаў (маюць 30 атамаў вугляроду) і *стэроідаў* (26—29 атамаў вугляроду). Большасць С. — крышт. рэчывы, растваральніках; вылучаны з неамыляльнай фракцыі *ліпідаў*. Прысутнічаюць у тканках жывёл і раслін, найб. пашыраныя прадстаўнікі стэроідаў у прыродзе. Падзяляюцца на зоастэрыны (з жывёл), фітастэрыны (з раслін), мікастэрыны (з грыбоў) і С. мікраарганізмаў. Найб. вядомы С. вышэйшых жывёл — *халестэрын*. У іх С. ўтрымліваюцца ў нерв. тканцы, печані, крыві, клетках спермы, скурным тлушчы і інш. Выкарыстоўваюцца для атрымання стэроідных гармонаў і іх вытворных, вітаміну D.

СТЭРЭА... (ад грэч. stereos цвёрды, аб'ёмны, прасторавы), першая састаўная частка складаных слоў, якая паказвае на аб'ёмнасць ці наяўнасць прасторавага размеркавання (напр., *стэрэаметрыя, стэрэаскоп*), на цвёрдасць, пастаянства (напр., *стэрэатыпія*).

СТЭРЭАІЗАМЕРЫ́Я, тое, што *прасторавая ізамерыя*.

СТЭРЭАКАЎЛА́Н (Stereocaulon), род лішайнікаў сям. стэрэакаўланавых. 100 відаў. Пашыраны ўсюды. На Беларусі найб. вядомыя С.: загушчаны (S. condensatum), інкруставаны (S. incrustatum) і лямцавы (S. tomentosum). Трапляюцца ў хвойных лясах, на пясчанай глебе, камянях.



Стэрэакаўлан лямцавы.

Слаявіна псеўдакусцістая, першасная (гарыз.) — зярніста-бародаўчатая, лускаватая, другасная (верт.) — з цыліндрычных або акруглых галінак, на паверхні якой утвараюцца выраслы, што маюць водарасці з родаў *насток* і стыганема. Пладовыя цельцы (*апатэцыі*) канцавыя або бакавыя, карычневага адцення. Сумкі булавападобныя, 8-спо́равыя. Споры палачкападобныя. Размнажэнне пераважна вегетатыўнае.

У.У.Галубкоў.

СТЭРЭАМЕ́ТРЫЯ (ад *стэрэа...* + *... метрыя*), частка элементарнай геаметрыі, у якой вывучаюцца ўласцівасці геам. фігур у прасторы. Гл. таксама *Планіметрыя*.

СТЭРЭАПА́РА, сукупнасць 2 плоскіх відарысаў аднаго і таго ж аб'ёмнага аб'екта, атрыманых з 2 роўнаддаленых ад яго пунктаў здымкі. Пры разглядзе С., напр., праз *стэрэаскоп* адзін відарыс успрымаецца наглядальнікам левым вокам, другі — правым, што стварае ўражанне аб'ёмнасці відарысу (гл. *Стэрэаскапічны відарыс*). С. выкарыстоўваюць у *стэрэаскапічным кіно*, *стэрэаскапічным тэлебачанні* і інш.

СТЭРЭАРЭГУЛЯ́РНЫЯ ПАЛІМЕ́РЫ, палімеры, лінейныя *макрамалекулы* якіх складаюцца з манамерных звёнаў аднолькавай або розных прасторавых канфігурацый, што чаргуюцца паводле пэўнай заканамернасці.

Канфігурацыя асобных звёнаў вызначаецца прасторавым размяшчэннем замяшчальнікаў вакол цэнтраў стэрэаізамерыі — тэтраэдрычнага атама вугляроду, падвойнай сувязі або цыкла (гл. *Прасторавая ізамерыя*). Упарадкаванае размяшчэнне эквівалентных цэнтраў стэрэаізамерыі ў асн. ланцугу наз. т а к т ы ч н а с ц ю. Палімер, у якім кожнае манамернае звяно мае адзін цэнтр стэрэаізамерыі, наз. і з а т а к т ы ч н ы м, калі канфігурацыі гэтых цэнтраў аднолькавыя, або с і н д ы я т а к т ы ч н ы м, калі суседнія цэнтры маюць процілеглыя канфігурацыі. Да С.п. адносяць *каўчук натуральны* (1,4-*цыс*-поліізапрэн), *гутаперчу* (1,4-*транс*-поліізапрэн), *цэлюлозу* і некат. яе вытворныя, якія, як і большасць сінт. С.п., маюць ізатактычную структуру. Асн. адрозненне С.п. ад нерэгулярных (атактычных) — здольнасць С.п. утвараць трохвымерныя крышталі. У прам-сці выпускаюць шэраг С.п. (напр., ізатактычны *поліпрапілен*, стэрэарэгулярны *бутадыенавы каўчук*), якія маюць лепшыя фіз.-хім. ўласцівасці, чым адпаведныя атактычныя палімеры. Гл. таксама *Высокамалекулярныя злучэнні*.

М.Р.Пракапчук.

СТЭРЭАСКАПІ́ЧНАЕ КІНО́, с т э р э а к і н о, від кінематографа, метады і тэхн. сродкі якога дазваляюць стварыць у гледача ўражанне аб'ёмнасці (стэрэаскапічнасці) відарысаў, што назіраюцца на экране.

Уражанне аб'ёмнасці відарысаў дасягаецца спец. стэрэакіназдымкай, пры якой аб'ект (сцэну) здымаюць адначасова з 2 пунктаў так, каб на кінастужцы атрымаліся *стэрэапары*. Каб 2 відарысы стэрэапары пры іх праектаванні на экран успрымаліся гледачом, як аб'ёмны відарыс (гл. *Бінакулярны зрок*), неабходна забяспечыць праекцыю на сятчатку кожнага вока прызначанага яму відарыса. Такое раздзяленне відарысаў стэрэапары дасягаецца з дапамогай спец. акуляраў (акулярная сістэма) з палярызацыйнымі святлафільтрамі (паляроідамі) або выкарыстаннем растравага экрана (безакулярная сістэма). Існуюць таксама сістэмы С.к. на аснове галаграфіі (гл. *Галаграфічнае кіно*). У СССР безакулярная сістэма С.к. прапанавана С.П.Іванoвым (1935; пробная дэманстрацыя 1937). З 1939 распаўсюдзілася акулярная сістэма. На Беларусі стэрэафільмы па сістэме «СТЭРЭА-70» дэманструюцца з 1978 (Мінск).

СТЭРЭАСКАПІ́ЧНАЕ ТЭЛЕБА́ЧАННЕ, сістэма *тэлебачання*, якая стварае ў гледача ўражанне аб'ёмнасці відарыса. Грунтуецца на бінакулярнасці зроку (гл. *Бінакулярны зрок*). Перадача відарысаў (чорна-белых ці каляровых) *стэрэапары*

можа быць адначасовая або паслядоўная. Разнавіднасць С.т. — шматракурснае тэлебачанне. Выкарыстоўваецца ў асн. для прыкладных мэт.

У найб. простых сістэмах С.т. відарысы стэрэапары пачаргова ўзнаўляюцца на экране кінескопа і глядач назірае іх праз святлоклапанныя акуляры, сінхранізаваныя з разгорткай тэлевізара так, каб левы відарыс накіраваць у левае вока, а правы — у правае. Існуюць інш. метады перадачы і пабудавання тэлевізійных прыёмнікаў, у т.л. праекцыйных, якія таксама патрабуюць выкарыстання акуляраў (святлоклапанных, каляровых, паляроідных ці іх камбінацыі). У безакулярных сістэмах С.т. экран кінескопа мае лінзава-растравую оптыку і пры выбары пэўнага вугла назірання левы відарыс накіроўваецца ў левае вока, правы — у правае. Перспектывы С.т. звязваюць з *лічбавым тэлебачаннем*, а таксама з камп'ютэрнымі спосабамі апрацоўкі відарысаў.

Літ.: Джакония В.Е., Коганер С.Э., Ткаченко А.П. Стереоскопическое телевидение // Бытовая радиоэлектронная техника. Мн., 1995. *А.П.Ткачэнка.*

СТЭРЭАСКАПІ́ЧНЫ ВІДАРЫ́С, відарыс, які ўспрымаецца аб'ёмным у выніку стэрэаскапічнага эфекту, абумоўленага *бінакулярным зрокам* чалавека. Узнікае пры праектаванні ці назіранні стэрэапар з дапамогай *стэрэаскопа*, растравага экрана, акуляраў з паляроідамі і інш., а таксама *галаграм*.

СТЭРЭАСКАПІ́ЧНЫ ДАЛЬНАМЕ́Р, бінакулярны дальнамер, тып *дальнамера* ў выглядзе двайной зрокавай трубы з акулярамі. Адлегласць да аб'екта вызначаецца па лікавым значэнні зрушэння аптычнага *кампенсатара*, дзе відарыс аб'екта сумяшчаюць з відарысам спец. метак («марак»), якія знаходзяцца ў факальнай плоскасці дальнамера.



Стэрэаскапічны дальнамер: 1 — агульны выгляд; 2 — поле зроку з «маркамі».

СТЭРЭАСКАПІ́ЧНЫ ДРУК, паліграфічны спосаб атрымання аб'ёмных *стэрэаскапічных відарысаў* на паперы. Бывае двухфарбавы і растравы. Выкарыстоўваецца для выдання наглядных дапаможнікаў, каляровых паштовак, дзіцячых карцінак, для вырабу 2 сюжэтных (зменлівых) відарысаў на значках і сувенірах.

Фатаграфаванне аб'екта робяць з 2 пунктаў (перамяшчэннем фотаапарата) ці з паваротам аб'екта на вугал, адпаведны бачанню двума вокамі. Атрыманыя 2 выявы (*стэрэапара*) з'яўляюцца арыгіналамі для *рэпрадукцыйных працэсаў* пры вырабе друкарскіх форм: адна выява прызначана для правага, другая для левага вока. Абедзве выявы аб'екта ўспрымаюцца бінакулярным зрокам як адна аб'ёмная. Пры двухфарбавым С.д. выкарыстоўваюць сіне-зялёны колер для левага і аранжава-чырвоны для правага вока. Разглядаюць стэрэаадбітак праз спец. акуляры-святлафільтры і бачаць пры гэтым адзін чорна-белы аб'ёмны відарыс. Пры растравым С.д. выкарыстоўваюць лінейны лінзава-цыліндрычны *растр* для фіксацыі аб'ёмнасці аб'екта пры фатаграфаванні і яго ўзнаўленні на адбітку. Аб'ёмнасць мнагафарбавага адбітка назіраюць праз лінейны лінзава-выпуклы растр.

Літ.: Ложбанидзе В.А., Ромейков И.В. Объемная печать. Тбилиси, 1981.

СТЭРЭАСКО́П (ад *стэрэа...* + *...скоп*), бінакулярны аптычны прыбор для атрымання аб'ёмнага адлюстравання мясцовасці па здымках *стэрэапары*. Забяспечвае раздзяленне зроку левага і правага вока, таксама павелічэнне фотаадлюстравання. Паводле канструкцыі С. бываюць лінзавыя, люстэркавыя, люстэркава-лінзавыя і падзяляюцца на партатыўныя, настольныя і стацыянарныя. Камплектуюцца з вымяральнымі і рысавальнымі прыстасаваннямі. Выкарыстоўваюцца для дэшыфравання аэрафотаздымкаў пры складанні геал., геамарфал., тапаграфічных і інш. карт.

Ф.Е.Шалькевіч.

СТЭРЭАТАПАГРАФІ́ЧНАЯ ЗДЫ́МКА (ад *стэрэа...* + грэч. topos месца + *...граф*), стэрэафотаграмметрычная здымка, метад *тапаграфічнай здымкі*, пры якім адлюстраванне контураў і рэльефу мясцовасці на картах атрымліваюць з дапамогай *стэрэапар* аэрафотаздымкаў зямной паверхні. Базіруецца на даследаваннях *стэрэафотаграмметрыі*. Асн. працэсы С.з.: аэрафотаздымка мясцовасці; вызначэнне геадэзічных каардынат некат. апорных пунктаў і маршрутнае дэшыфраванне; камеральныя работы (згушчэнне сеткі апорных пунктаў, суцэльнае дэшыфраванне, здымка контураў і рэльефу, складанне арыгінала карты). Згушчэнне апорных пунктаў выконваецца аналагавым спосабам з дапамогай *стэрэафотаграмметрычных прыладаў*, або аналітычным спосабам, калі вымярэнне каардынат пунктаў здымка выконваецца на аналіт. прыборах. С.з. выкарыстоўваецца для стварэння карт і планаў, вывучэння лінейных аб'ектаў, помнікаў архітэктуры, дынамічных з'яў, пошуку карысных выкапняў.

Ф.Е.Шалькевіч.

СТЭРЭАТРУБА́, бінакулярная перыскапічная аптычная прылада для назірання з-за ўкрыцця, вывучэння мясцовасці і цэлей, вымярэння вуглоў і адлегласцей. Складаецца з 2 зрокавых труб з акулярамі, трымальніка, лімба і трыногі. Дае 10-кратнае (з насадачнай лінзай 20-кратнае) павелічэнне. Пераменны стэрэабазіс (адлегласць паміж аб'ектывамі, макс. да 75 см) забяспечвае атрыманне стэрэаскапічнага відарыса. Вуглы вымяраюцца пры дапамозе вугламернай сеткі, якая знаходзіцца ў правым акуляры.

СТЭРЭАТЫ́П САЦЫЯ́ЛЬНЫ, адносна ўстойлівы, спрошчана-рэдукаваны вобраз ці ўяўленне пра пэўны сац. аб'ект (індывіда, групу, падзею і інш.); эмацыянальная форма выяўлення сац. *установак*. Тэрмін «С.с.» ўведзены ў навуку амер. публіцыстам і сацыёлагам У.Ліпманам у працы «Грамадская думка» (1921). Механізм С.с. заснаваны на псіхал. працэсе абагульнення свайго і чужога вопыту ўспрымання і ацэнкі сац. з'яў і працэсаў; фарміруецца ва ўмовах няпоўнай ці пераменлівай інфармацыі пра пэўны сац. аб'ект як тыпізаваныя, стандартызаваныя, часам шаблонныя ўяўленні асобных індывідаў ці груп. Устойлівасць С.с. адыгрывае станоўчую ролю ў паўсядзённай практыцы людзей, але не адпавядае патрабаванням зменлівай, праблематычнай сітуацыі. Ва ўмовах сац. трансфармацый С.с. часам прыводзяць да скажонага ўспрымання і неадэкватных, прадузятых меркаванняў пра пэўныя сац. групы і з'явы, таму важна карэкціраваць уздзеянне С.с. на асобу ці сац. групу на аснове верыфікацыі сапраўднасці ці памылковасці вобразаў і ацэнак, якія складаюць С.с.

Я.М.Бабосаў.

СТЭРЭАТЫ́ПІЯ (ад *стэрэа...* + грэч. typos адбітак, форма), выраб копій *друкарскіх форм* (стэрэатыпаў) *высокага друку*. Дае магчымасць друкаваць выданні з аднолькавых форм-копій адначасова на некалькіх машынах, выраб-



Стэрэатруба: 1 — лімб; 2 — круглы ватэрпас; 3 — акуляры; 4 — зрокавыя трубы; 5 — аптычная насадка; 6 — барабан верхняга і махавік ніжняга чарвяка.

ляць формы для высокапрадукцыйных ратацыйных машын. Прыдатная для друкавання вял. тыражамі кніжна-часопісных, ілюстраваных і інш. масавых выданняў, а таксама набраных дробным кеглем (энцыклапедый, слоўнікаў), перавыданняў (з захаваннем матрыц).

Стэрэатыпы — копіі арыгінальнай друкарскай формы з адліўнога *набору* і *кліша*, выраблены ў маштабе 1:1. Маюць форму маналітнай пласціны або часткі цыліндра з друкарскага сплаву (гарту), медзі, пластмасы або гумы з рэльефнымі друкавальнымі элементамі. Працэс С. ўключае: цісненне матрыц (на спец. матрычных прэсах); атрыманне стэрэатыпаў ліццём (матрыцу заліваюць спец. сплавам на стэрэатыпных адліўных станках), электралітычным спосабам (на матрыцу ў



Стэрэатыпія: а — схема прасавання матрыц-штампаў з наборнай формы (1 — металічны ліст; 2 — зменныя абмежавальнікі; 3 — матрычны прэс-пакет; 4 — прэс-форма; 5 — арыгінальная форма); б — схема прасавання стэрэатыпаў (1 — матрыца; 2 — ліст пластмасы; 3 — пліта халоднага прэса; 4 — прэс-форма).

гальванічнай ванне нарошчваюць слой металу, які ўтварае паверхневы друкавальны слой стэрэатыпа; гл. *Гальванастэрэатыпія*), упрасоўваннем матрыцы ў тэрмапластычную пластмасавую або гумавую пласціну ў падагрэтым стане; адлівам стэрэатыпа (апрацоўка па росце або таўшчыні, паглыбленне буйных прагалаў, апрацоўка тарцоў і інш.). Для павышэння тыражаўстойлівасці літыя стэрэатыпы пакрываюць хромам або нікелем, гальванастэрэатыпы часам храміруюць. У сувязі з аператыўным развіццём *афсетнага друку*, *флексаграфскага друку* і ўжываннем фотапалімерных форм у высокім друку з канца 20 ст. выкарыстанне С. скарачаецца.

Літ.: Колосов А.И. Наборные и стереотипные процессы. М., 1977; Полянский Н.Н. Основы полиграфического производства. 2 изд. М., 1991. *У.М.Сацута.*

СТЭРЭАФАНІ́ЧНЫ ГУКАЗА́ПІС, метад *гуказапісу*, пры якім *фанаграма* мае дадатковую інфармацыю аб прасторавым размяшчэнні крыніц гуку. Пры гэтым эл. сігналы ад розных мікрафонаў перадаюцца па розных каналах сувязі і запісваюцца асобна на розных дарожках фанаграмы. У быт. апаратуры найб. пашыраны 2-канальны С.г., у стэрэафанічным кінематографе (напр., панарамным, шырокафарматным) выкарыстоўваецца 3- (і больш) канальны.

СТЭРЭАФАНІ́Я (ад *стэрэа...* + *...фон*), спосаб перадачы і ўзнаўлення гуку, пры якім захоўваецца ўспрымання прасторавага размеркавання крыніц гуку.

Ажыццяўляецца з дапамогай шматканальных гукаперадавальных сістэм. У студыі 2 ці больш аднолькавых мікрафонаў размяшчаюцца на пэўнай адлегласці адзін ад аднаго, і эл. сігнал ад кожнага з іх перадаецца па асобным канале сувязі ці запісваецца на *фанаграму* з адпаведнай колькасцю дарожак (гл. *Стэрэафанічны гуказапіс*). Для *гукаўзнаўлення* на прыёмным баку размяшчаецца такая ж колькасць гучнагаварыцеляў, кожны з якіх атрымлівае сігнал ад адпаведнага мікрафона, што стварае ў слухачоў уражанне аб'ёмнасці гучання. Існуюць спосабы С., напр. Dolby, якія пры наяўнасці толькі 2 сігналаў ствараюць эфект аб'ёмнасці гуку высокай якасці. Сістэмы С. выкарыстоўваюцца ў стэрэафанічных радыёпрыёмніках, электрафонах, апаратуры стэрэфанічнага кіно, у канцэртных залах, тэатрах і інш.

СТЭРЭАФОТАГРАММЕТРЫ́ЧНАЯ ЗДЫ́МКА, тое, што *стэрэатапаграфічная здымка*.

СТЭРЭАФОТАГРАММЕТРЫ́ЧНЫЯ ПРЫЛА́ДЫ, оптыка-механічныя, электронныя прылады і комплексы (з камп'ютэрамі) для вымярэнняў памераў, формы і каардынат аб'ектаў мясцовасці па *стэрэапарах* фотаздымкаў, таксама для стварэння тапаграфічных карт і планаў. Падзяляюцца на універсальныя (выконваецца ўвесь комплекс тэхнал. працэсаў) і прылады дыферэнцыравання метаду, да якіх адносяцца: стэрэакампаратары (вызначэнне элементаў арыентавання), стэрэометры (рысоўка рэльефу), фотатрансфарматары (стварэнне плана). На лічбавых фотаграмметрычных комплексах праводзіцца аналітычная апрацоўка аэра- і касм. здымкаў, складаюцца лічбавыя тапаграфічныя і кадастравыя планы, ортафотакарты і ортафотапланы. *Ф.Е.Шалькевіч.*

СТЭРЭАФОТАГРАММЕТРЫ́Я (ад *стэрэа...* + *фотаграмметрыя*), раздзел фотаграмметрыі, які вывучае геаметрычныя ўласцівасці *стэрэапар* фотаздымкаў і метады вызначэння памераў, формы, прасторавага становішча прадметаў на іх. Адрозніваюць С. аэра-, касм. і наземную. Даследаванні па С. праводзяць з дапамогай оптыка-мех., электронных *стэрэафотаграмметрычных прылад* і комплексаў (з камп'ютэрамі). *Ф.Е.Шалькевіч.*

СТЭРЭАХІ́МІЯ (ад *стэрэа...* + *хімія*), раздзел хіміі, які даследуе фіз. і хім. ўласцівасці рэчываў у сувязі з прасторавай будовай хім. часціц, з якіх яны складаюцца. Найважн. задача С. — атрыманне індывід. стэрэаізамераў, вызначэнне іх прасторавай будовы і вывучэнне ўласцівасцей. Прасторавая будова малекул істотна ўплывае на біял. актыўнасць рэчываў (напр., вызначае фармакалагічнае дзеянне шэрагу лек. прэпаратаў), таму важнае практычнае значэнне мае атрыманне энантыямерна чыстых злучэнняў, што з'яўляецца асн. задачай спец. раздзела С. — стэрэаселектыўнага сінтэзу.

Фундаментальнымі ў С. з'яўляюцца паняцці канфігурацыі (гл. *Канфігурацыя* ў хіміі) і *канфармацыі*, якія поўнасцю апісваюць прасторавую будову хім. часціц. Канфігурацыя паказвае пэўнае прасторавае размяшчэнне атамаў адносна элементаў упарадкаванасці (цэнтраў, восей або плоскасцей). Канфармацыі характарызуюць любыя формы існавання часціцы пэўнай будовы і канфігурацыі, якія дасягаюцца без парушэння яе цэласнасці. Канфармацыі малекул вывучае адзін з асн. раздзелаў С. — *канфармацыйны аналіз*. С. непасрэдна звязана са стэрэаізамерыяй, ці *прасторавай ізамерыяй*, якая заключаецца ў розным прасторавым размяшчэнні некат. структурных фрагментаў адпаведных ізамераў пры поўнай ідэнтычнасці саставу і паслядоўнасці злучэння іх атамаў. Стэрэаізамеры, якім уласціва *хіральнасць* (такія ізамеры адносяцца адзін да аднаго як аб'ект і несумяшчальны з ім яго адбітак у ідэальна плоскім люстэрку) наз. аптычнымі антыподамі ці энантыямерамі (гл. *Аптычная ізамерыя*), усе астатнія стэрэамеры наз. *дыястэрэамерамі*. Гісторыя С. пачалася ў 1815 з адкрыцця франц. фізікам Ж.Б.Біо *аптычнай актыўнасці* шэрагу арган. злучэнняў у растворах. Станаўленне С. звязана з працамі Л.*Пастэра*, Я.Вант-Гофа (гл. Я.Х.*Гоф* вант), Ж.А.*Ле Беля*, А.*Вернера*, К.*Інгалда*, У.*Прэлага* і інш. Значны ўклад у развіццё С. зрабілі лаўрэаты Нобелеўскай прэміі Д.Х.Р.*Бартан*, Дж.У.*Корнфарт*, О.*Хасель*, японскі хімік Р.Наёры, амер. вучоныя У.Ноўлс і Б.Шарплес. Гл. таксама *Арганічная хімія*.

Літ.: Ногради М. Стереохимия: Основные понятия и приложения: Пер. с англ. М., 1984; Потапов В.М. Стереохимия. 2 изд. М., 1988. *Ц.А.Шаўчук.*

СТЭ́ФАН (Стеван), імя правіцеляў *Сербіі* ў 12—15 ст. Найб. значны уклад у гісторыю краіны зрабілі:

Стэфан Няманя (1113 або 1114—1200), вялікі жупан (князь) каля 1170—96, заснавальнік сербскай дзяржавы і дынастыі *Няманічаў*. Аб'яднаў значную ч. сербскіх зямель у адзіную дзяржаву. У 1190 пасля шэрагу сутыкненняў (1172, 1183 і інш.) з *Візантыяй* дамогся ад яе прызнання незалежнасці Сербіі. У 1196 перадаў уладу сыну Стэфану Першавянчанаму і прыняў манаства.

Стэфан Первавянчаны (?—24.9.1227), вялікі жупан з 1196, кароль з 1217 (каранаваны ў 1219). Працягваў палітыку бацькі, вёў барацьбу з рознымі групамі феадалаў. Ваяваў з Венгрыяй, Балгарыяй, *Лацінскай імперыяй*. Каралеўскі тытул атрымаў ад рым. папы. Аўтар жыцця Стэфана Нямані (1216).

Стэфан Душан (каля 1308—20.12.1355), кароль з 1331, цар з 1345. З дынастыі Няманічаў. У выніку працяглых войнаў з Візантыяй далучыў да Сербіі македонскія, алб. і частку грэч. зямель і ўтварыў вял. серба-грэч. царства, па-за межамі якога засталіся карэнныя сербскія вобласці Хум і Мачва. У канцы 1345 абвясціў сербскую архіепіскапію патрыярхіяй і каранаваны «царом сербаў і грэкаў». У 1349 выдаў збор законаў («Законнік»), які ўмацоўваў феад. парадкі.

Стэфан Лазаравіч (каля 1377—19.7.1427), князь з 1389, дэспат з 1402. Сын кн. Лазара [1371—89], які загінуў у бітве на *Косавым полі* (1389). Быў васалам тур. султана, але спрабаваў

умацаваць цэнтр. ўладу і аб'яднаць сербскія землі. Імкнучыся да вызвалення ад тур. залежнасці, заключыў саюз з каралём Венгрыі, ад якога дамогся ўступкі г. Бялград цаной фактычнага прызнання венг. пратэктарату над Сербіяй. Зрабіў Бялград сталіцай краіны, пашырыў свае ўладанні да рэк Сава і Дунай і Адрыятычнага м.

СТЭ́ФАН (Stefan) Іозеф (24.3.1835, г. Клагенфурт, Аўстрыя — 7.1.1893), аўстрыйскі фізік, заснавальнік навук. школы фізікаў. Чл. Венскай АН (1865). Вучыўся ў Венскім ун-це (1853—58), дзе і працаваў (з 1863 праф., з 1869 дырэктар Ін-та эксперым. фізікі). Навук. працы па оптыцы, акустыцы, электрамагнетызме, кінетычнай тэорыі газаў, тэорыі цеплавога выпрамянення. Распрацаваў тэорыю дыфузіі газаў, вызначыў каэфіцыенты цеплаправоднасці для многіх газаў. Устанавіў залежнасць энергіі выпрамянення нагрэтага цела (гл. *Стэфана—Больцмана закон выпрамянення*), увёў адну з фундаментальных фіз. пастаянных (гл. *Стэфана—Больцмана пастаянная*).

Літ.: Л ь о ц ц и М. История физики: Пер. с итал. М., 1970. С. 334—336.

СТЭ́ФАН III ВЯЛІ́КІ (Stefan III cel Mare; ?—2.8.1504), гаспадар (князь) *Малдаўскага княства* з 1457, палкаводзец. Праводзіў палітыку ўмацавання цэнтр. улады, задушэння баярскай апазіцыі. У 1467 разбіў армію венг. караля *Мацьяша Хуньядзі*, які ўварваўся ў Малдову. 17.1.1475 каля г. Васлуй (цяпер у Румыніі) на чале малд.-венг.-польскага войска (47 тыс. чал.) разграміў тур. армію (120 тыс. чал.), але паражэнне ад туркаў у 1476 прымусіла яго прызнаць залежнасць Малдовы ад Турцыі. Абапіраючыся на саюз з Маскоўскім вял. княствам (яго дачка Алена была нявесткай вял. кн. *Івана III*) заключыў мір з Крымскім ханствам (1492) і распачаў вайну супраць польскага караля Яна Ольбрахта, які імкнуўся аднавіць былую васальную залежнасць Малдовы ад Польшчы. У бітве ў Казьмінскім лесе (*Букавіна*) 26.10.1497 разбіў польскае войска. Гэтае паражэнне, а таксама ініцыіраванае Стэфанам тур. ўварванне ў Польшчу, патрабаванні венг. караля Уласла II (Уладзіслава II) і Івана III прымусілі Яна Ольбрахта спыніць агрэсію супраць Малдовы. У 1499 Польшча і Турцыя прызналі яе незалежнасць. С. III В. — герой малд. нар. песень і паданняў. У Кішынёве яму пастаўлены помнік. *М.Г.Нікіцін.*

СТЭ́ФАН БЛУА́СКІ (Stephen of Blois; каля 1097, г. Блуа, Францыя — 25.10.1154), кароль Англіі [1135—54]. Сын графа Блуа, пляменнік англ. караля Генрыха I [1100—35]. Пасля смерці апошняга часткай англ. феадалаў быў прызнаны каралём. З 1139 вёў з пераменным поспехам барацьбу за ўладу з дачкой Генрыха I Мацільдай, якая таксама прэтэндавала на прастол. У краіне ў гэты час панавала феад. анархія. У 1153 С.Б. ў абмен на адмову Мацільды ад далейшай барацьбы прызнаў сваім наследнікам яе сына Генрыха (кароль Генрых II у 1154—89; заснавальнік дынастыі *Плантагенетаў*).

СТЭ́ФАНА—БО́ЛЬЦМАНА ЗАКО́Н ВЫПРАМЯНЕ́ННЯ, фізічны закон, які вызначае поўную (па ўсіх даўжынях хваль) выпрамяняльную здольнасць *абсалютна чорнага цела*. Паводле гэтага закону $U = \sigma T^4$, дзе U — поўная (інтэгральная) выпрамяняльная здольнасць і T — абс. тэмпература абс. чорнага цела, σ — *Стэфана—Больцмана пастаянная*. Адкрыты эксперыментальна І.*Стэфанам* (1879) і тэарэтычна абгрунтаваны з пазіцый тэрмадынамікі Л.*Больцманам* (1884). Вынікае з *Планка закону выпрамянення* пры інтэграванні спектральнай выпрамяняльнай здольнасці абс. чорнага цела па ўсіх частотах (ад 0 да ∞). Выкарыстоўваецца ў прыладах для вымярэння высокіх тэмператур.

СТЭ́ФАНА—БО́ЛЬЦМАНА ПАСТАЯ́ННАЯ, адна з фундаментальных фіз. пастаянных, якая ўваходзіць у *Стэфана—Больцмана закон выпрамянення*. С.-Б.п. $\sigma = 5{,}67032(71)\cdot10^{-8}$ Вт/(м$^2\cdot$К^4). Уведзена І.*Стэфанам* (1879). Выкарыстоўваецца ў тэорыі цеплавога выпрамянення, піраметрыі, статыстычнай фізіцы і тэрмадынаміцы.

СТЭФА́НІ Іосіф Людвіг, музыкант і капельмайстар 2-й пал. 18 ст. Вучыўся ў Кёнігсбергскай акадэміі, дзе атрымаў муз., а таксама філас. і юрыд. адукацыю. Вучань І.*Канта*. У 1779 выкладаў клавікорды ў *Слонімскай музычнай школе*, у 1780—81 капельмайстар т.зв. «хатняй музыкі» ў Шклове (Магілёўская вобл.) у графа С.Г.Зорыча.

Літ.: Д а д и о м о в а О.В. Музыкальная культура городов Белоруссии XVIII в. Мн., 1992. *Н.В.Сазановіч.*

СТЭФАНО́ВІЧ Пятро (Пётр Францавіч; н. 28.6.1922, в. Сёмкаў Гарадок Мінскага р-на), бел. пісьменнік, перакладчык. Скончыў Ашмянскую гімназію (1939). Працаваў на будоўлях, у 1974—84 у час. «Вожык». Друкуецца з 1941. Перакладае з польскай на бел. і рус. мовы, з бел. на польскую. На польскую мову пераклаў кн. для дзяцей «Дзе хто начуе» А.Лойкі, «Паспяшайся ў наш звярынец» П.Марціновіча, «Еду ў госці да слана» (усе 1981) і «Сцяпан — вялікі пан» (1983) А.Вольскага, «Казкі, поўныя цудаў» І.Бурсава (1982), «Верабейка ў сватах» В.Віткі (1985), бел. нар. казкі «Ліса-хітрыца» (1982), «Удовін сын» (1983). На бел. мову пераклаў пасобныя творы Я.Бжэхвы, Я.Гушчы, В.Жукроўскага, Э.Кабаца, Ю.Озгі-Міхальскага, Я.Парандоўскага, Е.Путраманта, Т.Ружэвіча, У.Рэйманта і інш. Складальнік анталогій сучасных польскіх пісьменнікаў «Ад Буга да Одры» (1969) і «Вясёлы калейдаскоп» (1979).

СТЭ́ФАНСАН (Stefansson) Вільямур (3.11.1879, г. Гімлі, Канада — 26.8.1962), канадскі палярны даследчык і этнограф. У 1904—05 праводзіў археал. і этнаграф. даследаванні ў Ісландыі, у 1906—12 — на паўн.-зах. узбярэжжы Амерыкі. У 1913—18 кіраваў Канадскай арктычнай экспедыцыяй, даследаваў а-вы Банкс і Прынс-Патрык. У 1915 адкрыў «Зямлю Бордэн» (фактычна групу з 3 а-воў), у 1916 — а-вы Міен і Лохід. Яго імем названы востраў каля паўн.-ўсх. ўзбярэжжа в-ва Вікторыя.

Літ.: О л ь х и н а Е.А. Вильямур Стефансон. М., 1970.



Дж.**Стэфенсан**.

СТЭФЕ́НЗІЯ (Stephensia), род сумчатых грыбоў сям. труфелевых. 1 від — С. атласная (S. bombycina). Пашырана ў Еўропе. На Беларусі трапляецца летам, пераважна ў хваёвых лясах, занесена ў Чырв. кнігу.

Пладовыя целы падземныя, клубнепадобныя, дыяметрам 2—3 см. Перыдый (абалонка) амаль гладкі, звіліста складкаваты, бураваты, ад мякаці не аддзяляецца. Мякаць з пустымі каналамі (хадамі), белаватая, шчыльная, з моцным спецыфічным пахам і непрыемным смакам. Сумкі вузкія, 8-споравыя, слоем высцілаюць каналы. Сумкаспоры шарападобныя, гладкія, амаль бясколерныя. Умоўна ядомая. *С.І.Бельская.*



Стэфензія атласная.

СТЭ́ФЕНСАН, С т ы в е н с а н (Stephenson) Джордж (9.6.1781, Уайлем, каля г. Ньюкасл-эпон-Тайн, Вялікабрытанія — 12.8.1848), англійскі канструктар і вынаходнік у галіне паравога чыг. транспарту. З 1812 гал. механік капальняў у Нартамберлендзе. Вынайшоў руднічную лямпу арыгінальнай канструкцыі (1815). З 1814 займаўся канструяваннем паравозаў. У 1823 заснаваў у Ньюкасле першы ў свеце паравозабуд. з-д, дзе стварыў практычна прыгодныя

ўзоры паравозаў, у т.л. «Ракету» (1829) для чыгункі Манчэстэр—Ліверпул. Пабудаваў першую чыгунку агульнага карыстання Дарлінгтан—Стоктан (адкрыта ў 1825).

Літ.: Виргинский В.С. Джордж Стефенсон, 1781—1848. М.; Л., 1964.

СТЭХІЯМЕ́ТРЫЯ (ад грэч. stoicheion аснова, элемент + ...*метрыя*), вучэнне аб колькасных суадносінах паміж масамі або аб'ёмамі рэчываў, што ўступаюць у хім. рэакцыю. Уключае правілы састаўлення хім. формул і *ўраўненняў хімічных*. Тэрмін «С.» ўвёў у 1793 ням. хімік І.В.Рыхтэр. Заснавана на *масы захавання законе, эквівалентаў законе, Авагадра законе, Гей-Люсака законе* (закон аб'ёмных адносін), *пастаянства саставу законе, кратных адносін законе*. Суадносіны, у якіх адпаведна законам С. рэчывы ўступаюць у рэакцыю, наз. стэхіяметрычнымі, таксама наз. злучэнні, састаў якіх адпавядае гэтым законам.

СТЭ́ЦКІ Казімір Пятровіч (20.9.1905, хутар Пад'ельнік, Барысаўскі пав. Мінскай губ. — 16.8.1984), бел. рэжысёр. Засл. дз. маст. Беларусі (1965). Скончыў Кіеўскі ўкр. ін-т тэатр. мастацтва (1936). Працаваў у т-рах Беларусі: Польскім вандроўным (1929—30), Лепельскім калгасна-саўгасным (1939—41), Бабруйскім і Баранавіцкім абл. драм.(1944—45), Мазырскім ансамблі песні і танца (з 1946), Рэсп. Доме нар. творчасці (з 1947). У 1958—77 рэжысёр на Рэсп. студыі тэлебачання. Творчыя рысы С. найб. раскрыліся ў жанрах грамадска-паліт. тэлевяшчання: караткаметражных фільмах, рэпартажах з месца падзей, тэленарысах. Сярод тэатр. пастановак: «Хто смяецца апошнім» К.Крапівы, «Ірынка» К.Чорнага, «Не было ні гроша, ды раптам шастак» А.Астроўскага, «Сыночак» М.Мэё і М.Энекена (1939—41), «Урок жыцця» В.Галаўчынера (1945). *Л.І.Балыніна.*

СУАДНО́СІНЫ НЕАЗНАЧА́ЛЬНАСЦЕЙ, гл. *Неазначальнасцей суадносіны.*

СУА́РЭС ГАНСА́ЛЕС (Suárez González) Адольфа (н. 25.9.1932, г. Себрэрас, Іспанія), іспанскі дзярж. і паліт. дзеяч. Скончыў Саламанкскі і Мадрыдскі ун-ты. Д-р права. Быў грамадз. губернатарам у Сеговіі, ген. дырэктарам ісп. радыё і тэлебачання, прэзідэнтам Нац. кампаніі турызму. У першым пасля смерці ў 1975 рэгента Ф.*Франка Баамондэ* ўрадзе Іспаніі міністр — ген. сакратар Нац. руху (адзінай легальнай ісп. паліт. партыі). У 1976—81 прэм'ер-міністр Іспаніі. Шмат зрабіў для дэмакратызацыі паліт. жыцця краіны: былі вызвалены ўсе палітвязні, легалізавана шматпартыйнасць, праведзены першыя свабодныя выбары, распрацавана новая канстытуцыя, нац. меншасці атрымалі аўтаномію і інш.

СУБ... (ад лац. sub пад), першая састаўная частка складаных слоў, якая паказвае на знаходжанне ўнізе, пад чым-н.. каля чаго-н. (напр., *сублітараль, субмарына*); падпарадкаванасць, падначаленасць (напр., *субардынацыя*); неасноўнае, пабочнае, меншае па розных параметрах за тое, што абазначана асновай слова (напр., *субарэнда, субкультура).*

СУБАЛЬПІ́ЙСКАЯ РАСЛІ́ННАСЦЬ, тып высакагорнай расліннасці, пашыранай у *субальпійскім поясе* горных абласцей умераных і субтрапічных шырот. Развіваецца ва ўмовах магутнага снегавога покрыва, раўнамернай і высокай вільготнасці паветра і глебы пры добрым дрэнажы паверхні (напр., Альпы, Каўказ). Пераважаюць згуртаванні субальпійскіх лугоў (травастой выш. да 1,5—2,5 м, суцэльнае задзернаванне злакамі і разнатраўем), нізкарослых хмызнякоў і кусцікаў (хваёвы і кедравы сланікі, рададэндраны), травяністых пустэльных лугоў (нізкарослыя травы), асветленых лясоў паркавага тыпу (субальпійскае крывалессе і рэдкалессе). Характар С.р. мяняецца ў залежнасці ад геагр. становішча горнай сістэмы, экспазіцыі і стромкасці схілаў, а таксама ад антрапагеннага ўздзеяння. *А.Я.Яротаў.*

СУБАЛЬПІ́ЙСКІ ПО́ЯС, вышынны прыродны пояс у гарах умераных і субтрапічных шырот з перавагай *субальпійскай расліннасці.* Размяшчаецца ніжэй *альпійскага пояса* і вышэй лясного горнага (у вільготных раёнах) ці стэпавага горнага (у сухіх раёнах) паясоў. Яго вышыннае становішча вызначаецца геагр. шыратой, экспазіцыяй схілаў, ступенню кантынентальнасці клімату (напр., у Альпах і на З Каўказа С.п. размешчаны на выш. 1700—2300 м, на паўд. схілах Гімалаяў на выш. 3200—4000 м, у больш высокіх шыротах і абласцях, ахалоджаных марскімі цячэннямі, напр. на Курыльскіх а-вах, С.п. апускаецца да ўзроўню мора). Клімат халаднаваты, вільготны, снегавое покрыва 6—8 мес. Характэрны голыя скалы, восыпы, на пакатых схілах формы мярзлотнага рэльефу; субальпійскія лугі ў спалучэнні з хмызняковымі згуртаваннямі і крывалессем на горна-лугавых глебах; летнія пашы. У гарах Забайкалля, Сярэдняй і Усх. Сібіры месца С.п. займае падгальцовы пояс, дзе пераважаюць разрэджаныя прыгнечаныя лясы і рэдкалессі, зараснікі хмызняку, кедравага сланіку ў спалучэнні з невял. ўчасткамі лугоў, травастой якіх не дасягае шчыльнасці і відавога складу субальпійскіх лугоў. *А.Я.Яротаў.*

СУБАНТАРКТЫ́ЧНЫ ПО́ЯС, субантарктыка, прыродны геагр. пояс у Паўд. паўшар'і паміж *умераным поясам* і *антарктычным поясам.* Ахоплівае акваторыю акіяна і астравы на Пн ад Антарктыды (паміж 58—60° і 65—67° паўд. ш.). Межы вызначаюцца сезоннымі перамяшчэннямі атм. фронту, які раздзяляе паветра антарктычнае і ўмераных шырот. Клімат акіянічны, вільготны, ападкаў каля 500 мм за год (пераважна ў выглядзе снегу), частыя мяцеліцы, штармавыя вятры, туманы. Зімой т-ры паветра ад -5 °С да -15 °С, вады ад -1,5 °С да -2 °С, акіян укрыты плаваючымі ільдамі, айсбергамі. Летам т-ра паветра і вады каля 0 °С. Салёнасць вод 33—34‰. Значнае ветравое хваляванне і зыб (выш. хваляў да 10 м). Воды багатыя планктонам, рыбай, трапляюцца кітападобныя. На астравах — лішайнікі, травы, кусты.

А.Я.Яротаў.

СУ́БАР, ялова-хваёвы або шыракалістахваёвы лес, дзе пераважае хвоя, а елка і дуб складаюць пастаянны дамешак у 1-м ярусе дрэвастою або ўтвараюць 2-і ярус ці добра развіты падрост. Параўнальна з *борам* фарміруецца на больш багатых і ўвільготненых супясчаных і пясчаных глебах з праслойкамі суглінку або падасланых марэнай. На Беларусі пашыраны С. з дамешкам елкі ў паўн. і цэнтр. ч. (Бел. Паазер'е, Бел. града), С. з дубам і ляшчынай на Пд (Палессе і Перадпалессе).

СУБАРДЫНА́ЦЫЯ (ад *суб*... + лац. ordinatio прывядзенне ў парадак), сістэма службовага падпарадкавання малодшых старшым, ніжэйшых органаў вышэйшым; у больш шырокім сэнсе — выкананне правіл службовай, у т.л. воінскай, дысцыпліны ва ўзаемаадносінах паміж рознымі па службовым становішчы і званні асобамі. Гл. таксама *Табель аб рангах.*

СУБАРКТЫ́ЧНЫ ПО́ЯС, субарктыка, прыродны геагр. пояс у Паўн. паўшар'і паміж *умераным поясам* і *арктычным поясам*, у межах ад 60—65° да 67—73° паўн. ш. Межы вызначаюцца сезоннымі перамяшчэннямі атм. фронту, што раздзяляе паветра арктычнае і ўмераных шырот; а таксама напрамкам цёплых і халодных цячэнняў, пашырэннем сезонных ільдоў. Клімат халодны. Сярэднія т-ры студз. на мацерыках і астравах ад -5 °С да -40 °С, ліп. 5—12 °С. Летам пераважаюць зах. перанос паветраных мас умераных шырот і цыклоны, зімой — арктычнае паветра і антыцыклоны. Ападкаў 300—500 мм за год. Снегавое покрыва 8 месяцаў. Характэрны шматгадовая мерзлата і звязаныя з ёй формы рэльефу; моцная забалочанасць. Вегетац. перыяд 2—3 месяцы. На Пн пояса — *тундравая зона*, на Пд — *лесатундравая зона.* У паўн.-амер. і еўрап.-азіяцкім С.п. вылучаюць па 2 прыакіянічныя і па 1 кантынентальнаму сектару. Значная ч. акіянскай прасторы ў С.п. замярзае, воды халодныя (10—5 °С), маюць высокую біял. прадукцыйнасць (вял. колькасць планктону, рыб і інш.). *А.Я.Яротаў.*

СУБАРЭ́НДА (ад *суб*... + *арэнда*), перадача арандатарам са згоды арэндадаўцы арандаванай маёмасці ў паднаём іншай асобе. Паводле заканадаўства Рэспублікі Беларусь дагавор С. не можа быць заключаны на тэрмін, які перавышае тэрмін дагавору *арэнды.* Адказным па дагаворы С. перад арэндадаўцам застаецца

арандатар. Да дагавораў С. дастасоўваюцца правілы аб дагаворы арэнды, калі іншае не прадугледжана законам. Датэрміновае спыненне дагавора арэнды цягне за сабой і спыненне заключанага ў адпаведнасці з ім дагавора С. Субарандатар у гэтым выпадку мае права на заключэнне з арандатарам дагавора арэнды на маёмасць, якая знаходзілася ў яго карыстанні ў адпаведнасці з дагаворам С., у межах астатняга тэрміну С. на ўмовах, адпаведных умовам спыненага дагавора арэнды.

СУ́БАЦІЦА (Subotica), горад на Пн Югаславіі, у Сербіі, у б. аўт. краі Ваяводзіна. Каля 120 тыс. ж. (2001). Вузел чыгунак і аўтадарог. Цэнтр збожжавага раёна. Прам-сць: маш.-буд. (с.-г., эл.-тэхн.), харч., паліграф., хім., тэкст., дрэваапрацоўчая.

СУ́БАЧЫ, вёска ў Ваўкавыскім р-не Гродзенскай вобл. Цэнтр сельсавета і рэсп. с.-г. унітарнага прадпрыемства. За 8 км на ПнЗ ад горада і чыг. ст. Ваўкавыск, 80 км ад Гродна. 732 ж., 246 двароў (2001). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Касцёл. Брацкая магіла сав. воінаў. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

СУБВЕ́НЦЫЯ (ад лац. subventio дапамога), грашовая сума, якая выдзяляецца дзяржавай з бюджэту вышэйстаячага ўзроўню на пэўны тэрмін і на канкрэтныя мэты для выраўноўвання сац.-эканам. развіцця адпаведнага нац.-дзярж. або адм.-тэр. ўтварэння. У адрозненне ад *датацыі* С. павінна быць выкарыстана строга па мэтавым прызначэнні і ва ўстаноўлены тэрмін; у адваротным выпадку С. падлягае вяртанню ў орган, які яе прадаставіў.

СУБДАМІНА́НТА (ад *суб...* + *дамінанта*), у музыцы, назва IV ступені *гамы*; у *гармоніі* — назва акордаў, што ўтвараюцца на гэтай ступені, а таксама функцыі, якая ўключае акорды на IV, II, II нізкай, VI ступенях. У танальна-функцыян. сістэме гармоніі выяўляецца ўзаемасувязь С. (пазначаецца лац. літарай S), *тонікі* (T), дамінанты (D).

Літ.: гл. да арт. *Гармонія, Лад, Танальнасць.*

Т.А.Дубкова.

СУБДУ́КЦЫЯ (ад *суб...* + лац. ductio вядзенне, правядзенне), падсоўванне пліт *літасферы* акіянічнай зямной кары і парод мантыі пад край інш. літасферных пліт (паводле гіпотэзы новай глабальнай тэктонікі). Суправаджаецца ўзнікненнем зон глыбакафокусных землетрасенняў (гл. *Зона Беньофа*) і актыўных вулканічных *астраўных дуг*. Гл. *Тэктанічныя гіпотэзы*.

СУБ'ЕКТ (лац. subjectum), філасофская катэгорыя, якая абазначае крыніцу актыўнасці, накіраваную на *аб'ект*, носьбіта прадметна-практычнай дзейнасці і пазнання (індывіда ці сац. групу). У гісторыі філасофіі тэрмін «С.» ужываўся ў розных сэнсах: як індывід. быццё і матэрыя (Арыстоцель), нешта рэальнае, што існуе ў рэчах, супрацьлеглае аб'екту, які існуе толькі ў інтэлекце (схаластыка) і інш. Сучаснае разуменне паняцця «С». звязана з вучэннем Р.Дэкарта, які разглядаў С. як актыўны пачатак у пазнавальным працэсе, што дазволіла ў далейшым вывучаць умовы, формы і суб'ектыўныя перадумовы гэтага працэсу. Прадстаўнікі ідэалізму крыніцу актыўнасці бачаць у самім С. У матэрыялізме С. разглядаецца як ізаляваны біял. індывід, які пасіўна адлюстроўвае навакольную рэчаіснасць. Дыялект. матэрыялізм тлумачыць С. як прадукт гіст. развіцця і звязвае яго актыўнасць з матэрыяльна-пераўтваральнай дзейнасцю (гл. *Суб'ектыўны фактар* у гісторыі). У сацыялогіі С. — грамадства як самапазнавальная сац. сістэма, у вузкім сэнсе — асобныя людзі, групы, калектывы, якія арганізуюць і ажыццяўляюць працэс пазнання навакольнага асяроддзя з мэтай яго аналізу і тлумачэння. У сацыялогіі і філасофіі С. разглядаецца ў арган. адзінстве з аб'ектам. С. служыць крыніцай актыўнага пераўтварэння аб'екта, і ў той жа час з ускладненнем аб'екта (сац. з'яў, працэсаў) істотна мяняецца і сам С.: пашыраюцца межы яго дзейснасці, характар і кірункі пазнання.

І.В.Катляроў.

СУБ'Е́КТ ПРА́ВА, фізічная або юрыдычная асоба, якая валодае паводле закону здольнасцю мець і ажыццяўляць непасрэдна або праз прадстаўніка правы і юрыд. абавязацельствы. Неабходны элемент праваадносін ва ўсіх галінах права, але ў кожнай з іх яго суб'ект мае пэўную спецыфіку. Напр., у грамадзянскіх праваадносінах грамадзяне, чужаземцы і асобы без грамадзянства выступаюць як фіз. асобы; камерцыйныя і некамерцыйныя арг-цыі — як юрыд. асобы; трэці від суб'ектаў грамадзянскіх праваадносін складаюць дзяржава і дзярж. ўтварэнні. У адм. праваадносінах С.п. выступаюць у асноўным дзярж. органы, службовыя асобы, грамадзяне і толькі ў некат. выпадках — арг-цыі. Прызнаючы якую-н. асобу С.п., закон вызначае яго прававы статус, які характарызуе яго становішча адносна дзяржавы, дзярж. органаў, інш. асоб.

Г.А.Маслыка.

СУБ'ЕКТЫВІ́ЗМ, светапоглядная ці метадалагічная пазіцыя, якая адмаўляе аб'ектыўны падыход да пазнання рэчаіснасці, ігнаруе аб'ектыўны ход прыродных ці грамадскіх працэсаў. Характарызуецца абсалютызацыяй ролі *суб'екта* ў розных сферах дзейнасці, найперш у пазнанні. У гісторыі філасофіі прадстаўнікі С. — Дж.Берклі, Д.Юм, І.Фіхтэ; элементы С. прысутнічаюць у вучэнні І.Канта, у шэрагу філас. кірункаў канца 19—20 ст. (філасофія жыцця, прагматызм, экзістэнцыялізм і інш.). Філас. канцэпцыі С. абвяшчаюць абсалютную аўтаномію свядомасці, волі і дзейнасці суб'екта, часам адмаўляюць абумоўленасць паводзін людзей аб'ектыўнай рэчаіснасцю. У сферы пазнання сац. рэальнасці С. выяўляецца ў свядомым ці несвядомым падпарадкаванні даследавання каштоўным і ідэалагічным перавагам даследчыка; на эмпірычным узроўні пазнання С. — выбар фактаў для абгрунтавання загадзя прызнанай іерархіі каштоўнасцей. Часам С. прыводзіць да дагматызму і прэтэндавання пэўнай асобы ці сац. групы на валоданне абсалютнай ісцінай. У сац. практыцы С. служыць абгрунтаваннем *валюнтарызму*. Паліт. С. выяўляецца ў прыняцці рашэнняў на аснове адвольных установак, у ігнараванні грамадскіх заканамернасцей. У сферы міжасобасных адносін С. грунтуецца на суб'ектыўных фактарах сімпатыі і антыпатыі без уліку дзелавых і маральных якасцей асобы.

А.Б.Савеня.

СУБ'ЕКТЫ́ЎНАЕ, тое, што ўласціва *суб'екту* ці вытворнае ад яго дзейнасці. Уключае ўсе псіхічныя працэсы індывіда, з дапамогай якіх ён успрымае і адлюстроўвае ў сваёй свядомасці *аб'ектыўнае*. Адзін з гал. фактараў *пазнання*, якое ўяўляе сабой працэс пераходу ад С. да аб'ектыўнага. Часам пад С. разумеюць неадэкватнае ўяўленне, што не адпавядае аб'екту пазнання (гл. *Суб'ектывізм*).

СУБ'ЕКТЫ́ЎНАЕ ПРА́ВА, забяспечаная законам магчымасць фіз. або юрыд. асобы рэалізаваць сваё права шляхам выканання пэўных дзеянняў або патрабаваць пэўных паводзін ад інш. асоб. Так, уласнік рэчы мае права валодаць, карыстацца і распараджацца ёю ў рамках закона, не звяртаючыся па дапамогу да інш. асоб і не патрабуючы ад іх пэўных дзеянняў. Такія С.п. называюцца абсалютнымі, яны ахоўваюцца ад кожнага, хто сваімі паводзінамі перашкаджае іх ажыццяўленню. Па дагаворы ж куплі-продажу прадавец рэчы мае права патрабаваць ад яе пакупніка аплаты кошту рэчы, г.зн. выканання пэўнага дзеяння. Такое С.п. называецца адносным, паколькі патрабаванне адносіцца да пэўнай асобы. У выпадку парушэння С.п. яно абараняецца законам у прымусовым парадку шляхам прад'яўлення ў судзе або інш. дзярж. органе прэтэнзій да парушальніка.

СУБ'ЕКТЫ́ЎНЫ ІДЭАЛІ́ЗМ, філасофскі кірунак, прадстаўнікі якога лічаць *суб'ектыўнае* першасным у адносінах да аб'ектыўнага і адмаўляюць незалежнасць навакольнай рэчаіснасці ад волі і свядомасці *суб'екта*; адзін з асн. відаў *ідэалізму*.

СУБ'ЕКТЫ́ЎНЫ ФА́КТАР у гісторыі, паняцце матэрыяліст. філасофіі, якое абазначае дзейнасць *суб'ектаў* гіст. працэсу (народы, нацыі, саслоўі, класы, сац. і рэліг. рухі, партыі, асобы), накіраваную на захаванне ці змену пэўнага стану грамадства. Разам з паняццем аб'ектыўнага фактара (пэўныя гіст. ўмовы грамадскага развіцця) раскрывае змест дыялект. заканамернасці, згодна з якой людзі ствараюць сваю гісторыю

самі, але з улікам канкрэтных абставін, што склаліся незалежна ад волі суб'ектаў. У гісторыі адыгрывае адносна самаст. ролю, але абмежаваную аб'ектыўным кантэкстам гіст. падзей. Аб'ектыўныя адносіны і ўмовы акрэсліваюць гал. кірункі дзеяння С.ф. і ўплываюць на яго вынікі. Адрозніваюць узроўні (масавы, класавы, нац., асабісты) і формы праяўлення (паліт., ідэалагічная, арганізацыйная) С.ф. У пераломныя моманты гісторыі ён у стане аказаць уплыў на змест і накіраванасць грамадскіх пераўтварэнняў і рэформ. З пашырэннем уплыву С.ф. расце адказнасць суб'ектаў гіст. працэсу, што звязана з наяўнасцю ў распараджэнні вузкіх груп людзей сродкаў, якія могуць стварыць пагрозу цэлым народам ці ўсяму чалавецтву (гл. *Тэрарызм*). Крытэрыі гэтай адказнасці — імкненне да ўсеагульнага дабра, адэкватнае разуменне нар., нац. і дзярж. інтарэсаў, падпарадкаванне грамадз. дысцыпліне і ўсведамленне супадзення намаганняў усіх народаў па забеспячэнні справядлівых і гуманных умоў свайго існавання. *В.І.Боўш.*

СУБКУЛЬТУ́РА (ад *суб...* + *культура*), падкультура, панятце, якое абазначае культуру пэўнай сац. групы, што адрозніваецца ўласнымі каштоўнасцямі, звычаямі і нормамі. Феномен С. з'яўляецца вынікам шматграннасці і складанасці культ. жыцця, неаднароднасці культуры і яе драблення ў працэсе дэмакратызацыі сацыякульт. рэальнасці. Праблему С. разглядаюць у некалькіх аспектах: як асобную арг-цыю людзей (найчасцей моладзі); як самаст. цэласнае ўтварэнне ўнутры афіц. культуры, якое вызначае стыль жыцця і мыслення яе носьбітаў і адрозніваецца сваімі звычаямі, нормамі, комплексам каштоўнасцей і інстытутамі; як сукупнасць негатыўных норм, каштоўнасцей і дзеянняў людзей, якія супярэчаць прынцыпам афіц. культуры (дэлінквентная культура); як трансфармаваная сістэма каштоўнасцей традыц. культуры, якая набыла своеасаблівую светапоглядную афарбоўку. Праблемамі С. займаліся О.Шпенглер, Х.Артэга-і-Гасет, А.Тофлер, М.Брэйк, А.Моль, Э.Шойх, Р.Швентэр і інш. Адрозніваюць С. нац., рэліг., гендэрныя, узроставыя і прафес., афіц., неафіц. і інш. У залежнасці ад адносін С. да агульнапрынятых у грамадстве норм і каштоўнасцей вылучаюць пазітыўную і негатыўную (*контркультура*) С. Панятце С. дапамагае зразумець умовы дынамікі і фактары дыферэнцыяцыі і інтэграцыі культ. працэсу, якія адбываюцца пад уздзеяннем закону адзінства і разнастайнасці культуры.

Літ.: Журавлева Н.Б. Молодежная субкультура. Гродно, 1999; Токова Н.Ю. Молодежная субкультура. Могилев, 2000; Schivendter R. Teorie der Subkultur. Frankfurt am Main, 1976. *С.М.Зень.*

СУБЛІМА́ЦЫЯ (ад лац. sublimare узнімаць), узгонка, пераход рэчыва з цвёрдага стану непасрэдна (без плаўлення) у газападобны; адзін з *фазавых пераходаў* I роду.

Адбываецца з паглынаннем цеплаты пры т-рах і ціску, ніжэйшых за т-ру і ціск *тройнога пункта* рэчыва. Падпарадкоўваецца агульным законам *выпарэння*. Працэс, адваротны С. — кандэнсацыя цвёрдага рэчыва з газавай фазы (дэсублімацыя), адбываецца на цвёрдых паверхнях або ў аб'ёме газавай фазы з выдаленнем цвёрдага рэчыва ў выглядзе часцінак *аэразолю*. Выкарыстоўваюць для абязводжвання (сублімацыйная сушка) у выты-сці капрону, лаўсану і поліэтылену, пры атрыманні антыбіётыкаў, мед. прэпаратаў (плазмы крыві, кровазаменнікаў і інш.), харч. прадуктаў, для ачысткі неарган. (ёд, шэраг металаў, хларыд алюмінію) і арган. (антрахінон, бензойная і саліцылавая к-ты і інш.) рэчываў, матэрыялаў для мікраэлектронікі, для раздзялення ізатопаў урану і інш.

СУБЛІМА́ЦЫЯ ў псіхалогіі, псіхічны працэс пераўтварэння і пераключэння энергіі афектыўных памкненняў на мэты сац. дзейнасці і культ. творчасці. Ідэя С. адлюстравана ў творах пісьменнікаў 18 ст. (Г. Штылінг, Наваліс), у працах філосафаў 19 ст. (А.Шапенгаўэр, Ф.Ніцшэ). У навук. ўжытак тэрмін «С.» ўвёў *З.Фрэйд* у 1900. У пач. 20 ст. паняцце «С.» стала шырока выкарыстоўвацца ў псіхааналіт. філасофіі. У псіхааналізе Фрэйда С. — працэс, у выніку якога энергія, накіраваная першапачаткова на сексуальныя (*лібіда*) або агрэсіўныя мэты, перанакіроўваецца на дасягненне інш. сацыяльна і культурна санкцыянаваных мэт (спорт, інтэлектуальная праца, маст. творчасць, фарміраванне рэліг. абрадаў і культаў і інш.). На яго думку, сублімаваная энергія стварае цывілізацыю. М.*Шэлер* лічыў, што здольнасць да С. ўласціва ўсім формам арганізацыі прыроднага свету, а чалавек — апошні акт С. ў прыродзе. «Звышсублімацыя», на яго думку, — «празмерная інтэлектуалізацыя», якая ўласціва сучаснай культуры і выклікае ў чалавека дэструктыўныя схільнасці. Псіхааналіт. тэорыя разглядае С. як адзін са сродкаў вырашэння ўнутр. канфліктаў, якія ў адваротным выпадку прывялі б чалавека да *неўрозу*, няздольнасці знайсці адэкватнае выйсце са складаных жыццёвых сітуацый. Ідэі С. выкарыстоўваюцца ў псіхатэрапеўтычнай практыцы, *псіхалогіі сацыяльнай, псіхалогіі творчасці, дзіцячай псіхалогіі*, псіхалогіі спорту і інш.

Літ.: Теория личности в западноевропейской и американской психологии. Самара, 1996; Фрейд З. Введение в психоанализ // Фрейд З. Психоаналитические этюды. Мн., 1997. *С.Ф.Дубянецкі.*

СУБЛІТАРА́ЛЬ (ад *суб...* + *літараль*), зона марскога дна, прымеркаваная да шэльфа; размешчана паміж літараллю і *батыяллю*. Звычайна глыб. да 200 м. Часта С. абмяжоўваюць толькі зонай распаўсюджання донных раслін (да глыб. 40—150 м). С. — найб. прадукцыйная зона мора з вельмі багатай і разнастайнай фаунай і флорай (асн. прамысл. запасы марскіх прыдонных рыб, беспазваночных жывёл і раслін, шматлікія ігласкурыя, малюскі, чарвякі, ракападобныя).

СУБЛІТАРАТУ́РА, гл. *Масавая літаратура.*

СУБМАРЫ́НА (англ. submarine, ад *суб...* + лац. marina марская), англамоўная назва *падводнай лодкі.*

СУБО́РНАЯ СУБО́ТА, зборная субота, дзявочнік, дзявочы вечар, вянкі, старадаўні звычай усх. славян наладжваць вечарынку ў маладой напярэдадні *вяселля*. Асн. змест С.с. — развітанне нявесты з дзявочай свабодай. На Беларусі ў суботу вечарам у доме маладой збіраліся яе сяброўкі, сваячкі, суседзі, прыбіралі нявесту, заплятралі ёй касу, спявалі песні, вілі вянкі. У некат. мясцінах, асабліва на Палессі, да С.с. прымяркоўвалі абрад завівання вясельнага дрэўца: прыбіралі кветкамі вішнёвую, бярозавую ці яловую галінку — сімвал дзявоцтва. Часткова звычай бытуе і ў наш час (пераважна на З і ПдЗ Беларусі).

«СУБО́ТА», бел. і расійскі бытавы парна-масавы танец гарадскога паходжання. Муз. памер 2/4. Тэмп ад павольнага да хуткага. Танцуецца па крузе любой колькасцю пар. Складаецца з некалькіх простых танц. блокаў: крокаў з прыстаўкай, паваротаў у пары, перамен месцамі партнёраў. На Беларусі існуе ў некалькіх варыянтах, выконваецца з прыпеўкамі, часам з рэзкім, акцэнтаваным выпадам-прысяданнем на адну нагу. У пач. 20 ст. танец пашыраны амаль па ўсёй Беларусі. Сустракаецца і ў Расіі. *Ю.М.Чурко.*

СУБО́ТНІК, 1) выкананне добраахвотна і бясплатна якой-н. грамадска-карыснай працы ў суботу (або іншы выхадны дзень). Як грамадска-паліт. з'ява ўзнік у 1919 па ініцыятыве камуністаў (адсюль назва камуністычны С.), якія ў дэпо Масква-Сарціровачная адрамантавалі 3 паравозы. У СССР штогад праводзіўся Ленінскі (камуніст.) С. у суботу у 2-й пал. крас., у гонар нараджэння У.І.Леніна. З 1969 праводзіліся Усесаюзныя камуніст. С.

На Беларусі пасля распаду СССР праводзяцца С. на карысць грамадства, сродкі ад якіх ідуць на дапамогу дзецям-сіротам, пацярпелым ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС і інш. 2) С. наз. таксама сектант, які належыць да секты, што святкуе суботу замест нядзелі.

СУБО́ТНІКІ, вёска ў Іўеўскім р-не Гродзенскай вобл., на р. Гаўя. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 18 км на Пн ад г. Іўе, 172 км ад Гродна, 9 км ад чыг. ст. Юрацішкі. 780 ж., 309 двароў (2001). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, амбулаторыя, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў, партызан і ахвяр фашызму. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Помнік архітэкту-

ры — *Суботніцкі касцёл святога Уладзіслава.*

СУБО́ТНІЦКІ КАСЦЁЛ СВЯТО́ГА УЛАДЗІСЛА́ВА, помнік архітэктуры неаготыкі ў в. Суботнікі Іўеўскага р-на Гродзенскай вобл. Пабудаваны ў 1904—07 з цэглы па фундацыі графа У.Умястоўскага. Прамавугольны ў плане аб'ём накрыты 2-схільным дахам, 5-гранная апсіда — вальмавым, сім. сакрысціі — 2-схільнымі дахамі. Масіўная 3-ярусная вежа на гал. фасадзе завершана высокім шатром. Сцены рытмічна расчлянёны ступеньчатымі контрфорсамі, аконныя праёмы маюць стральчатыя і арачныя завяршэнні. Па баках вежы — невял. гранёныя аб'ёмы. У Вял. Айч. вайну быў часткова разбураны. У 1947 адноўлены, накрыты чарапіцай, у 1972 перакрыты бляхай. *Т.В.Габрусь.*



Суботніцкі касцёл святога Уладзіслава.

СУБПАДРА́ДЧЫК, гл. ў арт. *Падрад, падрадчык.*

СУБРАХУ́НАК, дадатковы рахунак, які адкрываецца ў банку ў дапаўненне да асн. рахункаў камерцыйных і інш. самафінансуемых арг-цый (разліковыя, бягучыя, карэспандэнцкія). С. маюць фінансуемыя ўласнікам установы, філіялы, аддзяленні па месцы іх знаходжання. Пры наяўнасці С. адпадае неабходнасць пералічыць кожную асобную суму, што спрашчае работу банкаў і кліентаў.

СУБСІ́ДЫЯ (да лац. subsidium дапамога), грашовая сума, якая вылучаецца на фінансаванне пэўных мерапрыемстваў і мае на ўвазе долевы ўдзел ніжэй стаячых бюджэтаў у гэтым фінансаванні; адзін са сродкаў (метадаў) бюджэтнага рэгулявання. Субсідзіраваць — г. зн. аказваць грашовую дапамогу, выдаваць С.

СУБСІДЫЯ́РНАЯ АДКА́ЗНАСЦЬ, дадатковая адказнасць асоб, якія разам з даўжніком адказваюць перад крэдыторам за належнае выкананне абавязацельстваў у выпадках, прадугледжаных законам або дагаворам; адзін з відаў грамадзянскай адказнасці. У адпаведнасці з Цывільным кодэксам Рэспублікі Беларусі С.а. нясуць: члены поўнага т-ва па яго абавязацельствах; удзельнікі т-ва з дадатковай адказнасцю, статутны фонд якога падзелены на долі вызначаных устаноўчымі дакументамі памераў — салідарна С.а. па абавязацельствах т-ва сваёй маёмасцю ў межах устаноўленых памераў; у выпадку банкруцтва даччынага т-ва па віне асн. т-ва апошняе нясе С.а. па яго даўгах; члены спажывецкага кааператыва — у межах няўнесенай часткі дадатковага ўзносу кожнага з членаў кааператыва. Грамадзянскае заканадаўства рэспублікі прадугледжвае і інш. выпадкі С.а.

Э.І.Кузьмянкова.

СУБСТАНТЫВА́ЦЫЯ (ад лац. substantivum назоўнік), пераход у разрад *назоўнікаў* слоў інш. часцін мовы ў выніку набыцця імі здольнасці ўказваць непасрэдна на прадмет, а не толькі на яго прыкмету; безафіксны спосаб утварэння назоўнікаў пераважна ад прыметнікаў як разнавіднасць *канверсіі*. Пры С. ўтвараюцца назоўнікі, што могуць мець значэнне асобы («хворы», «маладая»), прозвішча або мянушкі («Чорны», «Сівы»), відаў жывёлін («хобатныя», «хордавыя»), відаў страў («гарачае», «салодкае»), памяшканняў («мыйная», «сталовая»), інш. з'яў і прадметаў («праязны», «сутачныя») і г.д.

Субстантываваныя прыметнікі захоўваюць формы скланення прыметніка. Аказіянальна-кантэкставая С. можа закранаць і інш. часціны мовы («Ваша вечнае «не» мне надакучыла»; «Ну, давай «пяць» і не злуй болей»).

А.Я.Міхневіч.

СУБСТАНТЫ́ЎНЫЯ ФАРБАВА́ЛЬНІКІ, тое, што *прамыя фарбавальнікі.*

СУБСТА́НЦЫЯ (ад лац. substantia сутнасць, нешта, што ляжыць у аснове), першааснова ўсяго, што існуе, якая абумоўлівае ўзнікненне і знікненне канкрэтных рэчаў і з'яў; аб'ектыўная рэальнасць, якая разглядаецца ў аспекце яе ўнутранага адзінства. У філас. вучэннях пэўнае разуменне С. з'яўляецца іх зыходным пастулатам. У гісторыі філасофіі С. інтэрпрэтавалася па-рознаму: як матэрыял ці яе канкрэтнае ўтварэнне (Бог, дух, ідэя, сусв. розум і інш.); адрозніваюць метафізічнае тлумачэнне С. як нязменнага пачатку і дыялект. — як зменлівай, самаразвівальнай сутнасці. У колькаснай інтэрпрэтацыі праблемы С. вылучаюць 3 філас. прынцыпы: *манізм*, які лічыць, што ў аснове разнастайнага свету ляжыць 1 пачатак (Г.Гегель, К.Маркс), *дуалізм*, які прызнае існаванне 2 раўнапраўных С. (Р.Дэкарт) і *плюралізм*, паводле якога існуе мноства незалежных С. (Дэмакрыт, Г.Лейбніц). У сучаснай філасофіі існуюць супрацьлеглыя погляды: традыц. разуменне С. як першаасновы і першапрычыны свету (марксізм, неатамізм, неарэалізм) і негатыўнае стаўленне да катэгорыі С. і яе ролі ў пазнанні. Прадстаўнікі шэрагу кірункаў неапазітывізму лічаць, што паняцце С. з'яўляецца атрыбутам ненавук. свядомасці. Адмаўленне С. як першааснovы ўсяго існага характэрна і для новай анталогіі (М.Хайдэгер, Н.Гартман і інш.), дзе паняцце быцця аддзяляецца ад паняцця С.

Літ.: Орынбеков М.С. Проблема субстанции в философии и науке. Алма-Ата, 1975; Гартман Н. Старая и новая онтология: Пер. с нем. // Историко-философский ежегодник, 1988. М., 1988; Проблема первоначал в науке и теологии. СПб., 1993.

А.Б.Савеня.

СУБСТРА́Т (ад позналац. substratum аснова, літар. — падсцілка), сукупнасць адносна простых, якасна элементарных утварэнняў, узаемадзеянне якіх абумоўлівае ўласцівасці пэўнай сістэмы ці працэсу; агульная аснова ўсіх з'яў і працэсаў. Паняцце «С.» блізкае да *субстанцыі*, таму першапачаткова ў філасофіі іх не адрознівалі, але кожнае з іх датычыцца розных аспектаў рэчаіснасці. У адрозненне ад субстанцыі як фундаментальнай сутнасці быцця, якая забяспечвае ўнутр. адзінства канкрэтных рэчаў, з'яў і працэсаў, пад С. разумеюць найб. элементарны (ніжні) слой рэальнасці. У некат. матэрыяліст. вучэннях С. прызнаваліся непадзельныя *атамы*, у ідэаліст. — нематэрыяльная энергія (энергетызм), «элементы свету» (эмпірыякрытыцызм) і інш. Адрозніваюць метафізічна-матэрыяліст. тлумачэнне С., дзе С. разглядаецца як элементарны нязменны першапачатак і зыходны носьбіт усіх уласцівасцей, стану і атрыбутаў аб'ектыўнай рэальнасці, і дыялектыка-матэрыяліст. разуменне С., дзе прызнаецца змяняльная прырода С. як вынік узаемадзеяння форм *руху* і субстратнага аспекту матэрыяльнага быцця. У гэтых межах паняцце С. выкарыстоўваецца для характарыстыкі якаснай неаднароднасці сістэмнай арганізацыі *матэрыі* і разнастайнасці структурных узроўняў розных форм руху. С. фіз. працэсаў лічацца элементарныя часціцы і палі, фундаментальныя ўздзеянні якіх (гравітацыйныя, электрамагнітныя, слабыя і моцныя) абумоўліваюць фізіка-хім. формы руху. С. хім. рэакцый выступаюць атамы, якія захоўваюць устойлівасць пры стварэнні і пераўтварэнні розных відаў рэчываў. С. у біялогіі — аснова, да якой прымацаваны нерухомыя арганізмы (для мікраарганізмаў і раслін адначасова з'яўляецца пажыўным асяроддзем); апорны элемент навакольнага асяроддзя, напр., грунт вадаёмаў для бентасу. У біяхіміі С. — рэчыва, на якое ўздзейнічае фермент. С. сац. форм руху з'яўляецца чалавек, мэтанакіраваная дзейнасць якога ляжыць у аснове ўсіх сац. змен.

А.Б.Савеня.

СУБСТРА́Т у моваznаўстве, гл. ў арт. *Стратыфікацыя моў.*

СУБСТРА́Т ПАЖЫ́ЎНЫ, асяроддзе, што выкарыстоўваецца для вырошчван-

ня ў штучных умовах *культур мікраарганізмаў* і *культур тканак*. У мікрабіял. практыцы С.п. выкарыстоўваюць для лабаротрнай дыягностыкі інфекц. захворванняў, вылучэння мікробаў са знешняга асяроддзя і іх ідэнтыфікацыі, атрымання мікробных мас пры вытв-сці вакцын, антыбіётыкаў і інш.

Мікрабіялагічны С.п. — крыніца азоту, вугляроду, вадароду, мінер. рэчываў і мае пэўныя фіз.-хім. паказчыкі (pH, акісляльна-аднаўленчы патэнцыял, вязкасць, вільготнасць, асматычны ціск і інш.). Паводле забеспячэння неабходных умоў для мікраарганізмаў вылучаюць С.п. паўнацэнныя і дэфіцытныя; паводле кансістэнцыі — цвёрдыя (з *агар-агарам*, жэлацінам), паўвадкія (напр., 0,5%-ны мяса-пептонны агар), вадкія (мяса-пептонны булён, пептонная вада і інш.); паводле складу С.п. — простыя і складаныя (напр., мяса-пептонны цукр. булён, сінт. С.п.). Дыферэнцыяльна-дыягнастычныя С.п. дазваляюць вызначыць спецыфічныя якасці мікроба (напр., протэалітычную, гемалітычную актыўнасці). Электыўныя С.п. ствараюць аптымальныя ўмовы для пэўнага віду мікроба і неспрыяльныя для інш. (напр., С.п. Мюлера, Каўфмана для вылучэння кішэчных бактэрый). С.п. для вырошчвання культур тканак і вірусаў падзяляюць паводле складу на натуральныя, сінт. і паўсінт. (гідралізатныя), паводле прызначэння — на роставыя і падтрымліваючыя. Да натуральных адносяць эмбрыянальны экстракт, плазму і сываратку крыві, амніятычную вадкасць. Сінтэтычныя (Ігла, 199 і інш.) маюць у сабе комплекс амінакіслот, ферментаў і мікраэлементаў у солевых растворах. Гідралізатныя С.п. — прадукт гідролізу мяса, малака, дражджэй. Роставыя С.п. маюць сываратку, якая стымулюе рост культуры тканкі, падтрымліваючыя С.п. захоўваюць яе на стадыі манаслоя.

СУБСТЫТУ́ЦЫЯ (ад лац. substitutio стаўлю замест, перадаю ў замен), 1) назначэнне запаснога спадчынніка (субстытута) у завяшчанні. 2) У міжнар. праве — адна з форм матэрыяльнай адказнасці дзяржавы, разнавіднасць рэстытуцыі, якая ўяўляе сабой замену неправамерна знішчанай або пашкоджанай маёмасці, будынкаў, трансп. сродкаў, маст. каштоўнасцей, асабістай маёмасці і да т.п.

СУБТРАПІ́ЧНАЯ РАСЛІ́ННАСЦЬ, сукупнасць фітацэнозаў, пашыраных у *субтрапічных паясах*. Адрозніваюць расліннасць сухіх, паўсухіх і вільготных субтропікаў. У субтрапічных пустынях С.р. прадстаўлена эфемерамі і эфемероідамі; у абласцях міжземнаморскага клімату — вечназялёнымі (пераважна цвердалістымі) лясамі (з сямействаў букавых, лаўравых, магноліевых, хвойных і інш.) і згуртаваннямі вечназялёных (макві́с, гарыга, фрыгана) або лістападных кустоў (шыбляк); у вільготных субтропіках — вечназялёнымі шыракалістымі лясамі з прымессю лістападных парод (каштан, клён, дуб, ясень і інш.), мноствам эпіфітаў і ліян. *А.Я.Яротаў.*

СУБТРАПІ́ЧНЫ АНТЫЦЫКЛО́Н, вобласць высокага ціску ў субтрапічных шыротах, пастаянны цэнтр дзеяння атмасферы. У Паўн. паўшар'і да С.а. адносяцца *Азорскі антыцыклон* і *Гавайскі антыцыклон*, у Паўд. — Паўд.-Атлантычны, Паўд.-Ціхаакіянскі і Паўд.-Індыйскі антыцыклоны.

СУБТРАПІ́ЧНЫ КЛІ́МАТ, клімат субтрапічных шырот, які характарызуецца пераважай трапічных паветраных мас летам і ўмераных зімой. Вылучаецца цёплай зімой, гарачым летам, звычайна сезонным размеркаваннем ападкаў. Сярэдняя т-ра самага халоднага месяца вышэй за 0 °С, колькасць ападкаў памяншаецца ад прыакіянскіх да ўнутрымацерыковых раёнаў ад 1500—2000 мм да 100 мм за год. Да С.к. належыць *міжземнаморскі клімат*, *мусонны клімат*, кліматы субтрапічных, у т.л. халодных, пустынь. Гл. таксама *Субтрапічныя паясы.*

СУБТРАПІ́ЧНЫЯ ЛЯСЫ́, шыракалістыя лясы *субтрапічных паясоў* з пераважай вечназялёных дрэвавых і хмызняковых парод. Адрозніваюць С.л. вільготных (характарызуюцца меншай ксерафітнасцю дрэў, мноствам эпіфітаў і ліян) і сухіх субтропікаў. Найб. пашыраны ў Міжземнамор'і і Усх. Азіі. Гл. таксама *Субтрапічная расліннасць.*

СУБТРАПІ́ЧНЫЯ ПАЯСЫ́, субтропікі, прыродныя геагр. паясы ў Паўн. і Паўд. паўшар'ях Зямлі паміж *трапічнымі паясамі* і *ўмеранымі паясамі*. Размешчаны ў межах 30—40° паўн. і паўд. ш. Характарызуюцца чаргаваннем тэрмічных рэжымаў па паўгоддзях, пераважай трапічных пасатных паветраных мас летам і цыкланальнай цыркуляцыі ўмеранага пояса зімой, радыяцыйным балансам 70—100 ккал/см² за год. Пераважае *субтрапічны клімат*: Сярэднемесячныя т-ры паветра летам 20 °С і больш, зімой 4 °С і больш, што дазваляе бесперапынную вегетацыю раслін. Зімой магчымы замаразкі і невял. маразы (да -10 °С). На сушы С.п. колькасць ападкаў і кантынентальнасць клімату мяняюцца ад прыакіянічных раёнаў да ўнутрымацерыковых, што вызначае ландшафтныя адрозненні ў фарміраванні прыродных зон. На кожным з мацерыкоў у С.п. вылучаюцца 3 асн. сектары: зах. прыакіянічны (міжземнаморскі) з сухім летам і вільготнай зімой; унутрыкантынент. з бедным увільгатненнем; усх. прыакіянічны (мусонны) з багатым летнім увільгатненнем. Глебы і расліннасць мяняюцца ад вільготных вечназялёных і шыракалістых лясоў на чырваназемах і жаўтаземах да мусонных і цвердалістых лясоў, хмызнякоў і субтрапічных стэпаў на карычневых і шэра-карычневых глебах, ксерафітных рэдкалессяў, паўпустынь і пустынь на шэра-бурых глебах і шэраземах. Тэрыторыя С.п. здаўна гаспадарча асвоена: лясы моцна зведзены, вял. плошчы займаюць ворныя землі і плантацыі (вырошчваюць рыс, бавоўнік, чай, цытрусавыя, арахіс і інш.). Акіян у межах С.п. адрозніваецца высокай т-рай (у сярэднім 15—16 °С) і салёнасцю вады, нязначнай колькасцю прамысл. рыб.

М.В.Лаўрыновіч.

СУБУРБАНІЗА́ЦЫЯ (ад *суб...* + лац. urbanus гарадскі), працэс росту і развіцця *прыгараднай зоны* буйных гарадоў. У выніку С. адбываецца фарміраванне *гарадскіх агламерацый*. С. характэрны больш высокія тэмпы росту насельніцтва прыгарадаў і *гарадоў-спадарожнікаў* у параўнанні з цэнтрамі агламерацый.

СУБУРГА́Н, культавае збудаванне ў краінах Цэнтр. Азіі (найперш Манголіі), якое тыпалагічна паходзіць ад *ступы* (грабніцы лам, сховішчы, рэліквій, мемар. пабудовы). Складаецца з п'едэстала, дарасховішча і шпіля.

СУБФЕБРЫЛІТЭ́Т, тое, што *тэмпература цела субфебрыльная.*

СУБЭКВАТАРЫЯ́ЛЬНЫ КЛІ́МАТ, клімат субэкватарыяльных шырот. Характарызуецца высокай т-рай паветра, малымі ваганнямі яе значэнняў на працягу года і вял. колькасцю ападкаў (2000—2500 мм за год; на схілах гор, павернутых у бок летніх мусонаў, да 12 тыс. мм). Ад экватарыяльнага клімату адрозніваецца рэзка выражаным сухім зімовым перыядам. Атм. цыркуляцыя мае характар трапічных (экватарыяльных) мусонаў. Гл. таксама *Субэкватарыяльныя паясы.*

СУБЭКВАТАРЫЯ́ЛЬНЫЯ ПАЯСЫ́, прыродныя паясы Паўн. і Паўд. паўшар'яў Зямлі, паміж *экватарыяльным поясам* і *трапічнымі паясамі*. Характарызуюцца сезонным чаргаваннем сухога і вільготнага перыядаў (мусонна-пасатнай цыркуляцыяй атмасферы). Летам знаходзяцца пад уздзеяннем вільготных экватарыяльных паветраных мас (*мусонаў*), зімой — сухіх трапічных *пасатаў*. У напрамку ад экватарыяльнага да трапічнага паясоў мяняецца колькасць ападкаў ад 2000 да 250 мм за год і працягласць дажджлівага перыяду ад 9—10 да 2—3 месяцаў. Т-ры паветра пастаянна высокія, сярэднямесячныя — 15—32 °С. У тым жа напрамку паступова мяняюцца ландшафтныя зоны: пастаянна вільготныя лістападна-вечназялёныя лясы, сезонна вільготныя летнезялёныя лясы, саваннавыя светлыя паркавага тыпу лясы (саванны пальмавыя, баабабавыя, акацыевыя і інш.), ксерафітныя апустыненыя рэдкалессі і хмызнякі. Глебы мяняюцца ад слаба ападзоленых латэрытных да чырв.-карычневых і чырв.-бурых. Для горных краін у С.п. характэрны леса-лугавы (у вільготных раёнах) і рэдкалесна-стэпавы (у сухіх раёнах) спектры вышыннай пояснасці. Жывёльны свет прадстаўлены пераважна жвачнымі парнакапытнымі, драпежнымі, грызунамі, тэрмітамі, двухкрылымі і пе-

рапончата-двухкрылымі насякомымі і інш. У акіяне С.п. фіксуюцца межамі Паўн. Пасатнага цячэння. Сярэдняя т-ра вады 25 °С. Салёнасць памяншаецца ў напрамку да экватара да 37 °/₀₀. Слабае перамешванне вады вызначае недахоп кісларoду і нізкую колькасць планктону (50—70 мг/м³). Ландшафты моцна зменены чалавекам, асабліва ў Паўд. і Паўд.-Усх. Азіі. Тэрыторыі асвойваюць пад пашавую жывёлагадоўлю, земляробства і плантацыйныя гаспадаркі (вырошчваюць рыс, бавоўнік, трапічныя і інш. культуры). *М.В.Лыўрыновіч.*

СУ́ВА (Suva), горад, сталіца Фіджы, на паўд.-ўсх. беразе в-ва Віты-Леву. Засн. ў 1870-я г. 167,4 тыс. ж. з прыгарадамі (1996). Гал. порт краіны (вываз цукру, копры, какосавага алею, бананаў), вузел аўтадарог. Аэрапорт. Прамысл., гандл. і культ. цэнтр. краіны. Прам-сць: харч., буд. матэрыялаў, мылаварная, у навакollі цукр. з-ды. Паўднёваціхаакіянскі ун-т. Турызм.

СУВА́ЛКАЎСКАЕ ВАЯВО́ДСТВА (Województwo Suwalskie), былая адм.-тэр. адзінка на ПнУ Польшчы. З 1999 у складзе *Падляскага ваяводства*.

СУВА́ЛКІ (Suwałki), горад на ПнУ Польшчы, на р. Чорная Ганча, у Падляскім ваяводстве (у 1975—99 адм. цэнтр Сувалкаўскага ваяводства). Засн. у 1682—90. Каля 70 тыс. ж. (2001), сярод насельніцтва ёсць беларусы і літоўцы. Чыг. ст., вузел аўтадарог. Аэрапорт. Прам-сць харч. і дрэваапрацоўчая. Музей М.*Канапніцкай*. Турызм.

СУВА́НА ФУ́МА (7.10.1901, г. Луангпрабанг, Лаос — 10.1.1984), лаоскі дзярж. і паліт. дзеяч. З каралеўскай сям'і Лаоса, прынц; стрыечны брат *Суфанувонга*. Скончыў Парыжскі (1928) і Грэнобльскі (1930) ун-ты. У 1940-я г. ўдзельнічаў у нац.-вызв. руху Лао Ісара. Прэм'ер-міністр Каралеўства Лаос у 1951—54, 1956—58, 1962—75. У 1953 дамогся ад Францыі прызнання незалежнасці Лаоса. Узначальваў паліт. групоўку нейтралістаў, якія стаялі за прымірэнне правых сіл і Патрыят. фронту Лаоса (ПФЛ) на чале з Суфанувонгам. Па яго ініцыятыве ў 1957 і 1962 ствараліся кааліцыйныя ўрады Лаоса з удзелам усіх паліт. сіл, якія ў хуткім часе распадаліся. Пасля скасавання манархіі і абвяшчэння Лаоскай Нар.-Дэмакр. Рэспублікі са снеж. 1975 саветнік прэм'ер-міністра.

СУВЕНІ́Р (ад франц. souvenir памяць), памятны прадмет. Якасцямі С. валодаюць творы нар. або дэкар.-прыкладнога мастацтва, якія нясуць інфармацыю пра асаблівасці культуры народа, нагадваюць пра наведванне краіны, горада, музея і інш. (рэчы этнагр. характару, медалі, значкі, вымпелы, статуэткі, памяншаныя копіі скульпт. і арх. помнікаў і інш.), спец. выкананыя прадметы утылітарнага прызначэння, якія маюць геральдычную, спарт. і інш. сімволіку, інфармацыю пра пэўную падзею ці дату (блакноты, ручкі, паштоўкі, кубкі і інш.), звычайныя рэчы, звязаныя з гіст. падзеямі (напр., прадметы, прывезеныя з касмічнай арбітальнай станцыі, кавалкі т.зв. Берлінскай сцяны, сав. ядзерных ракет), з успамінамі пра пэўную асобу (напр., асабістая рэч вядомага чалавека, фамільная каштоўнасць). Існуюць спец. прадпрыемствы па вырабе С. (гл. ў арт. *Мастацкіх вырабаў вытворчасць*). *С.У.Пешын.*

СУВЕРЭНІТЭ́Т (ням. Souveränität ад франц. souveraineté вярхоўная ўлада), незалежнасць і паўнаўладдзе суб'екта дзярж.-паліт. і прававых адносін пры прынятці рашэнняў у межах сваёй кампетэнцыі і выкананні паўнамоцтваў улады. У распрацоўку навук. тэорыі С. значны ўклад зрабіў Ж.Ж.Русо («Аб грамадзянскім дагаворы, або Прынцыпы палітычнага права» 1762). Паводле Русо, улада суверэна ў асобе народа ў цэлым, не абмяжоўваецца ніякімі законамі або дагаворамі і можа быць пашырана на права жыцця і смерці любой асобы; адначасова адмаўляюцца гарантыі яе правоў, што прыводзіць да абсалютызацыі панящця С. Па сваёй прыродзе і сутнасці С. у Русо — агульная воля народа, якая шляхам *грамадскага дагавору* перадаецца дзяржаве. У навуцы і паліт. практыцы разглядаюцца асобныя віды С. — дзяржаўны, нацыянальны і народны. Пад дзяржаўным С. разумеюць самастойнасць дзярж. улады, яе вышэйшых органаў у ажыццяўленні атрыманага ад народа мандата на кіраванне дзяржавай; недапушчэнне ўмяшання ва ўнутр. і знешнюю палітыку з боку інш. дзяржаў. Дзярж. С. ажыццяўляецца праз практычную дзейнасць заканад., выканаўчай і судовай улад у адпаведнасці з канстытуцыйнымі паўнамоцтвамі і прынцыпамі. Нацыянальны С. з'яўляецца канкрэтным увасабленнем права нацыі і яе імкнення да захавання ўласнай ідэнтычнасці ў зносінах з інш. нацыямі і народамі. У межах і на падставе нац. С. вырашаюцца найважнейшыя праблемы нац. жыцця: *нацыянальнае самавызначэнне* і стварэнне ўласнай дзяржавы; самаст. развіццё ўкладу жыцця, нац. культуры, мовы, традыцый. Арганічная сувязь нац. С. з дзяржаўным выяўляецца ў нац. характары дзяржавы і адстойванні ёю *нацыянальных інтарэсаў*. Народны С. падкрэслівае прынцып паўнаўладдзя народа, якое служыць асн. вытокам усіх відаў і форм С. З 2-й пал. 20 ст. назіраецца пашырэнне панящця С. (у філасофіі, эканам. навуцы), калі ён фактычна атаясамліваецца са свабодай індывіда і яго правам самастойна і незалежна выбіраць адпаведны склад мыслення і паводзін (С. «спажыўца», «пакупніка» і г.д.). Прававой асновай С. Рэспублікі Беларусь з'яўляюцца *Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі і Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь*. Вызначэнне С. абумовіла прыняцце прававых норм, якія замацавалі грамадзянства Беларусі, уласнасць бел. народа на зямлю, нетры, паветраную прастору, нац., культ., і гіст. каштоўнасці, непадзельнасць і недатыкальнасць тэрыторыі, права на стварэнне сваіх фін.-крэдытнай і грашовай сістэм, на ўласныя ўзбр. сілы, права заключаць добраахвотныя саюзы з інш. дзяржавамі і выходзіць з гэтых саюзаў. *В.І.Боўш.*



А.В.Суворaў.

СУВО́ЙКІ (Vorticella), род раснічных інфузорый. Больш за 100 відаў. Пашыраны ў прэсных і марскіх водах. На Беларусі найб. адзначаецца С. маларотая (V.microstoma).

Даўж. каля 150 мкм. Цела званочкападобнае. Адзіночныя формы на скарачальнай спіральнай сцяблінцы, якой прымацоўваюцца да субстрату. Па краі ротавага дыска раснічны апарат; каляротавая спіраль пастаянна рухаецца і накіроўвае ток вады да ротавай адтуліны. Кормяцца бактэрыямі, дэтрытам. Пры бясполым размнажэнні ўтвараюцца «бадзяжкі», якія свабодна плаваюць, потым прымацоўваюцца. Ёсць і палавы працэс — кан'югацыя. Фільтратары вадаёмаў. Некат. — вонкавыя паразіты рыб. Іл. гл. да арт. *Інфузорыі*.

СУВО́РАЎ Аляксандр Васілевіч (24.11.1730, Масква — 18.5.1800), расійскі палкаводзец. Генералісімус (1799), граф Рымнікскі і «Свяшчэннай Рым. імперыі» (1789), кн. Італійскі (1799). На ваен. службе з 1747. Удзельнік *Сямігадовай вайны 1756—63*. У 1768—72 на чале палка, брыгады ваяваў супраць войск *Барскай канфедэрацыі* на Беларусі і ў Польшчы: 23.5.1771 разбіў асн. сілы канфедэратаў каля в. Лянцкарона (Польшча); у вер. 1771 за 2 тыдні прайшоў па маршруце Брэст — Бяроза — Косава — Палонка — Нясвіж — Клецк — Лагішын — Пінск — Драгічын — Антопаль — Брэст; 23.9.1771 каля мяст. Сталовічы (цяпер вёска ў Баранавіцкім р-не) разбіў атрад вял. гетмана ВКЛ М.К.*Агінскага*. У рус.-тур. вайну 1768—74 разбіў тур. войскі каля Казлуджы (Балгарыя, 1774). У 1774 накіраваны на Урал на разгром паўстання Е.І.*Пугачова*. У рус.-тур. вайну 1787—91 разбіў тур. войскі на *Кінбурнскай касе* (1787), пры Факшанах (цяпер Румынія) і на р. *Рымнік* (1789), штурмам узяў крэпасць *Ізмаіл* (1790). У час падаўлення *паўстання 1794* напачатку дзейнічаў на Брэстчыне, дзе ў *Крупчыцкім баі 1794* і каля Брэста (19 вер.) разбіў корпус ген. Ю.Серакоўскага; 5.11.1794 штурмам узяў Прагу (прадмесце Варшавы), пасля чаго Вар-

шава капітулявала. З 1795 валодаў на Брэстчыне маёнткам Кобрынскі Ключ. У 1797, за крытыку новых статутаў і абмундзіравання, звольнены імператарам Паўлам I і сасланы ў маёнтак Канчанскае Наўгародскай губ. З лют. 1799 галоўнакаманд. рас.-аўстр. саюзнымі войскамі антыфранц. кааліцыі ў Італіі, дзе нанёс шэраг паражэнняў франц. войскам (гл. *Італьянскі паход Суворава 1799*); на чале рас. войск з баямі пераадолеў Альпы (гл. *Швейцарскі паход Суворава 1799*). Аўтар прац «Палкавая ўстанова» і «Навука перамагаць». Прыхільнік смелага і рашучага наступлення як асн. формы баявых дзеянняў. У СССР з 1942 існаваў ордэн С. 3 ступеней (захоўваецца і ў рас. арміі). У 1943 створаны *суворaўскія ваенныя вучылішчы*, у т.л. ў 1953 у Мінску.

Літ.: Михайлов О.Н. Суворов. Ростов н/Д, 1997; Ростунов И.И. Генералиссимус А.В.Суворов: Жизнь и полководческая деятельность. М., 1989. *Н.М.Пліско.*

СУВО́РАЎСКІЯ ВАЕ́ННЫЯ ВУЧЫ́ЛІШЧЫ, (СВУ), сярэднія ваенныя навуч. ўстановы для падрыхтоўкі выхаванцаў да паступлення ў вышэйшыя ваен. навуч. ўстановы. Створаны паводле пастановы СНК СССР і ЦК ВКП(б) ад 21.8.1943. Названы ў гонар А.В.*Суворава*. У 1943—55 у СССР існавала каля 20 СВУ. У 1960-я г. частка вучылішчаў расфарміравана. У 1990-я г. ў Расіі СВУ існавалі ў Казані, Цверы, С.-Пецярбургу, Маскве, Екацярынбургу і інш. Навучанне і жыццё выхаванцаў арганізавана ў адпаведнасці з вайск. распарадкам і з улікам іх узросту. Гл. таксама *Мінскае суворaўскае ваеннае вучылішча*. *С.В.Папоў.*

СУВЫМЕ́РНЫЯ І НЕСУВЫМЕ́РНЫЯ ВЕЛІЧЫ́НІ, аднародныя велічыні, што маюць або адпаведна не маюць агульнай меры (велічыні такой жа прыроды), лікавае значэнне якой змяшчаецца цэлы лік разоў у кожнай з іх. Суадносіны сувымерных (несувымерных) велічынь выражаюцца рацыянальным (ірацыянальным) лікам. 2 адрэзкі — старана і дыяганаль квадрата — не маюць агульнай меры, якой бы малой ні была адзінка вымярэння. Несувымерныя таксама плошчы круга і квадрата, пабудаванага на радыусе гэтага круга.

Несувымернасць пэўных адрэзкаў адкрылі стараж.-грэч. матэматыкі. Гэта выклікала крызіс асноў грэч. матэматыкі (яна грунтавалася на панятці цэлых лікаў як меры ўсіх рэчаў), спрыяла далейшаму развіццю матэматыкі і прывяло да адкрыцця *ірацыянальных лікаў*.

СУ́ВЯЗІ МЕХАНІ́ЧНЫЯ, абмежаванні, якія накладваюцца на становішча або рух мех. сістэмы. Звычайна выяўляюцца з дапамогай якіх-н. цел (напр., троса ці стрыжня, на якіх падвешаны груз; паверхні, па якой рухаецца цела; шарніраў, што звязваюць звёны механізмаў; падшыпнікаў). С.м., якія накладваюць абмежаванні толькі на становішчы (або перамяшчэнні за час руху), наз. г е а м е т р ы ч н ы м і; С.м., якія накладваюць абмежаванні і на скорасці пунктаў сістэмы, — к і н е м а т ы ч н ы м і. С.м., для якіх сума элементарных работ усіх *рэакцый сувязей* на кожным магчымым перамяшчэнні сістэмы роўная нулю, наз. і д э а л ь н ы м і (напр., ідэальна гладкая паверхня, на якой адсутнічае трэнне).

СУ́ВЯЗЬ, узаемаабумоўленасць з'яў і працэсаў у прыродзе і грамадстве. Выяўленне ўстойлівых і неабходных С., аналіз *прычыны і выніку* як універсальнай С. з'яў рэчаіснасці ляжаць у аснове *пазнання* і навукі. У гісторыі пазнання прынцып усеагульнай узаемнай С. выступіў асн. прынцыпам *дыялектыкі*. З развіццём навукі пашыраецца тыпалогія С., якія класіфікуюць паводле форм дэтэрмінізму (адназначныя, імавернасныя і карэляцыйныя), іх сілы (жорсткія і карпускулярныя), кірунку дзеяння (прамыя і адваротныя), тыпу працэсаў, якія вызначае пэўная С. (С. функцыянавання, развіцця і кіравання) і інш. крытэрыяў.

СУ́ВЯЗЬ у э к а н о м і ц ы, галіна нар. гаспадаркі, якая забяспечвае перадачу і прыём інфармацыі рознымі тэхн. сродкамі; частка вытв. і сац. інфраструктуры грамадства, прызначана для задавальнення патрэб насельніцтва органаў дзярж. кіравання і суб'ектаў гаспадарання ў паслугах С.

У старажытнасці С. ажыццяўлялася праз пасланцоў (конных і пешых), якія перадавалі паведамленні вусна, а таксама падачай умоўных светлавых сігналаў. З узнікненнем пісьменнасці пачала складвацца паштовая С. (гл. *Пошта*). З пач. 19 ст. пачала стварацца правадная С. У 1832 П.Л.Шылінг вынайшаў эл. тэлеграф, у 1873 С. Морзе — электрамагнітны тэлегр. апарат, у 1876 А.Г.Бел — тэлефон, у 1895 А.С.Папоў — *радыё*, што стала пачаткам бяздротавай С. (гл. Сувязь у тэхніцы).

На Беларусі першая тэлегр. лінія Мінск — Бабруйск пачала працаваць у 1859. У 1896 у Мінску пабудавана тэлеф. станцыя на 100 нумароў, у пач. 20 ст. тэлеф. станцыі мелі 16 гарадоў Беларусі, працавала каля 400 прадпрыемстваў пошты і тэлеграфа. У 1925 у Гомелі і Мінску пачалі працаваць радыёстанцыі магутнасцю 1,2 кВт. У 1930-х г. развівалася міжгародняя тэлефонная С., будаваліся аўтам. тэлеф. станцыі. Да 1940 усе 195 гарадоў і раённых цэнтраў БССР былі тэлефанізаваны, 653 населеныя пункты абслугоўваліся міжгароднякі тэлеф. С. Сельская тэлеф. С. ахоплівала 80% сельсаветаў, амаль усе МТС, пераважную большасць калгасаў і саўгасаў. Пасля Вял. Айч. вайны сетка прадпрыемстваў С. адноўлена і пачала развівацца на новай тэхн. аснове. З 1945 дзейнічае пастаянная радыётэлегр. С. паміж Мінскам і Масквой, з 1966 у Мінску па фототэлеграфе прымаюцца матрыцы маскоўскіх газет, з 1967 працуе відэатэлефон. З 1956 у Мінску пачаліся рэгулярныя тэлевізійныя перадачы. Пабудаваны паштамты ў Мінску (1954), Віцебску (1960), Магілёве (1961), Гродне (1970). З 1970 у Мінску дзейнічае аўтам. міжгародняя тэлеф. станцыя, пазней такія станцыі створаны ў Віцебску, Гродне. У 1972 завершана аўтаматызацыя гар. і сельскай тэлеф. С. У 1980-я г. пачалося ўкараненне электронных тэлеф. станцый, з'явіліся першыя міжнар. каналы С. Мінск—Беласток, Мінск—Варшава. У 1990-я г. ўведзены ў эксплуатацыю першая ў СССР лічбавая аўтам. міжгародняя тэлеф. станцыя, комплекс станцый спадарожнікавай С., які забяспечыў тэлеф. С., *Інтэрнет*, абмен тэлевіз. праграмамі з Індыяй, Канадай, ЗША і інш. краінамі. Насельніцтва, прадпрыемствы і ўстановы Беларусі абслугоўваюць 118 гар. і раённых вузлоў і 3883 аддзяленні С., у т.л. 3100 сельскіх. У структуры С. разам з традыц. відамі актыўна ўкараняецца *радыёсувязь* і *перадача даных*, уведзена міжнар. тэлегр. станцыя «Тэлекс», пашыраецца сетка электроннай пошты. Укаранёны аўтаматызаваныя сістэмы апрацоўкі інфармацыі і падрыхтоўкі суправаджальнай дакументацыі па міжнар. пошце і інш. Створана сучасная лічбавая інфраструктура электрасувязі верхняга ўзроўню (гл. *Лічбавае радыёвяшчанне, Лічбавае тэлебачанне*). Здадзеныя ў эксплуатацыю на базе лічбавага абсталявання магістральныя валаконна-аптычныя лініі С. (гл. *Валаконна-аптычная сувязь*) звязалі паміж сабой усе абл. цэнтры рэспублікі; міжнар. лініі звязалі Беларусь з сумежнымі краінамі. Педжынгавая С. забяспечвае 40% тэр. краіны, *сотавай радыёсувяззю* можа карыстацца 55% насельніцтва рэспублікі, а з дапамогай роўмінга — яе абаненты ў Балгарыі, Латвіі, Літве, Польшчы, Расіі, Украіне. Трансліруецца 5 праграм тэлебачання і 6 радыёвяшчання (асн. паказчыкі С. агульнага карыстання гл. ў табл.). Беларусь з'яўляецца членам Міжнар. саюза электрасувязі, Сусветнага паштовага саюза, Міжнар. арг-цыі касм. сувязі і інш. *М.П.Талочка.*

СУ́ВЯЗЬ у т э х н і ц ы, перадача і прыём *інфармацыі* з дапамогай розных тэхн. сродкаў; галіна нар. гаспадаркі. Адрозніваюць *пошту, радыёвяшчанне, тэлебачанне, электрасувязь*, а таксама *перадачу даных* у лакальных і глабальных *камп'ютэрных сетках*. Усе сродкі С. (акрамя пошты) карыстаюцца эл.-магн. ваганнямі пэўных частот паводле шкалы, рэкамендаванай Міжнар. саюзам электрасувязі. Адбываецца пашырэнне відаў паслуг С., якія даюцца карыстальнікам у інтэрактыўным рэжыме, пераход на лічбавыя фарматы перадачы інфармацыі (гл. *Лічбавае радыёвяшчанне, Лічбавае тэлебачанне*), інтэграцыя электрасувязі і вяшчання з *Інтэрнетам*. *А.П.Ткачэнка.*

«СУ́ВЯЗЬ НЕЗАЛЕ́ЖНАСЦІ І НЕПАДЗЕ́ЛЬНАСЦІ БЕЛАРУ́СІ», арганізацыя, якая існавала ў 1917—18 у Вільні. У яе ўваходзілі В.*Ластоўскі*, князь В.Святаполк-Мірскі, барон К.Шафнагель і інш. З 2.6.1917 да 22.4.1918 выдала 4 лістоўкі з выкладам сваіх поглядаў

(іх аўтарам лічыцца Ластоўскі). Адмаўляла ідэю Канфедэрацыі Вялікага княства Літоўскага, паводле якой на бел. і літ. землях, акупіраваных Германіяй, прапаноўвалася стварыць бел.-літ. дзяржаву; выступала за злучэнне падзеленай фронтам Беларусі ў «адзін суцэльны і незалежны арганізм». Прапаноўвала ўстанавіць у незалежнай дзяржаве рэсп. лад, правесці беларусізацыю школ, рэліг. і дзярж. устаноў з забеспячэннем правоў нац. меншасцей. Выступала за тое, каб прадстаўнікі бел. народа «з абедзвюх старон фронту» былі дапушчаны на мірную канферэнцыю і каб яна прызнала незалежнасць Беларусі; выказвала надзею, што польскае грамадства не будзе чыніць перашкоды ў культ. і нац. будаўніцтве. Прызнаючы права літ. народа на незалежнасць, арг-цыя выступала супраць анексіянісцкіх памкненняў дзеячаў Літвы. Лічыла, што паліт. раўнавага ў Еўропе цесна звязана з вырашэннем укр. пытання, вітала Укр. раду і жадала, каб Украіна была прызнана незалежнай дзяржавай. Адначасова выказвалася за федэратыўныя сувязі з суседнімі народамі, вылучала ідэю «Беларуска-Украінскай федэратыўнай дзяржавы». Палажэнні праграмы, распрацаванай «С.н. і н.Б.», прыняты *Беларускім народным камітэтам* (БНК), канферэнцыяй БНК, *Беларускай сацыял-дэмакратычнай работніцкай групай* і Віленскім к-там *Беларускай сацыялістычнай грамады* (вер. 1917), а таксама *Беларускай канферэнцыяй 1918* у Вільні. Палажэнні гэтай праграмы спрабаваў ажыццявіць урад *Беларускай Народнай Рэспублікі*.

А.М.Сідарэвіч.

СУ́ГВАЗДЫ, вёска ў Валожынскім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 12 км на У ад г.Валожын, 70 км ад Мінска, 17 км ад чыг. ст. Палачаны. 386 ж., 144 двары (2001). Базавая школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

СУГЕСТЫ́ЎНАЯ ЛІ́РЫКА (ад лац. suggestio унушэнне, намёк), жанр *лірыкі*, у якім лірычнае перажыванне выяўляецца праз асацыятыўнае счапленне сэнсавых намёкаў, адценняў, непрааснены х і неўсвядомленых памкненняў, прадчуванняў, уяўленняў. У С.л. часта абуджаюцца цьмяныя фантаст. вобразы, што пад уплывам фальклору, міфалогіі адклаліся ў падсвядомасці. Прыклад С.л. — верш Я.Купалы «Ў вечным бо-ры...»:

Ў вечным боры цемнатворы
Скачуць, плачуць, весяляцца;
Жнуць, збіраюць дзіва-жніва
Ў сонным полі, ў горкай долі.

С.л. ўздзейнічае рытмамелодыкай, паўторамі, іншы раз — алагізмам ускосных намёкаў, хісткіх імпрэсій, вобразаў, інтанац.-моўных канструкцый. Так будуюцца паэмы, «квантэмы», «пункціры», «версэты» і «парадыгмы» А.Разанава. Рысы С.л. назіраюцца ў нар. песнях, замовах, загадках, прыгаворках. Узоры сугестыўнага лірызму, заснаваныя на медытацыі (гл. *Медытатыўная лірыка*), паглыбленым падтэксце, ёсць у Я.Купалы, М.Багдановіча, Цёткі, З.Бядулі, У.Дубоўкі, У.Хадыкі, У.Жылкі, Л.Геніюш, А.Пысіна, М.Стральцова і інш. Прырода С.л. даследавана недастаткова.

І.С.Шпакоўскі.

Табліца

Асноўныя паказчыкі сувязі агульнага карыстання на Беларусі

	1985	1990	1995	2000
Колькасць прадпрыемстваў сувязі (пошта, тэлеграф, тэлефон)	4468	4169	3940	3883
у т.л. ў сельскай мясцовасці	3476	3359	3137	3100
Адпраўлена, млн.				
пісьмаў	351	302	134	132
газет і часопісаў	1756	2200	568	531
пасылак	9,3	8,2	0,6	0,7
тэлеграм	10,8	10,6	2,4	1,5
грашовых пераводаў і пенсіённых выплат	31,1	37	32,8	30
Колькасць міжгародніх тэлефонных размоў, млн.	108,2	193,5	248,3	528,6
Колькасць тэлефонных апаратаў, тыс.	1099,6	1670,1	2087,8	2875
у т.л. у гарадах	861,4	1329	1676,8	2340
у сельскай мясцовасці	238,2	341,1	411	535
Забяспечанасць насельніцтва хатнімі тэлефонамі на 100 сем'яў, шт.	23	37	49	75
Колькасць абаненцкіх установак сеткі «Тэлекс», шт.	—	157	381	3152
Колькасць зарэгістраваных факсімільных апаратаў (тэлефаксаў), шт.	—	—	8901	26925

СУГЛІ́НАК, рыхлая пясчана-гліністая асадкавая горная парода, якая складаецца з часцінак памерам менш за 0,01 мм (30—50 %) і абломкавых часцінак больш за 0,01 мм (70—50 %). Мае ў сабе каля 10—30 % гліністых часцінак памерам менш за 0,005 мм. Лік пластычнасці 7—17.

Адрозніваюць С. груба-, дробназярністыя і пылаватыя. Паводле колькасці гліністага матэрыялу С. падзяляюцца на лёгкія, сярэднія і цяжкія. Мінер. склад пясчаных С. больш кварцавы, гліністых — з каалініту, іліту, мантмарыланіту і інш. Паходжанне пераважна кантынентальнае. Сыравіна для вытв-сці цэглы, аглапарыту. На Беларусі С. пашыраны сярод антрапагенавых адкладаў.

СУГЛІ́НІСТЫЯ ГЛЕ́БЫ, глебы, у якіх 20—50 % часцінак фіз. гліны. Развіваюцца на ўласна ледавіковых пародах (марэнах), стужачных глінах, лёсападобных суглінках, алювіяльных адкладах рачных поймаў. Падзяляюцца на *дзярнова-падзолістыя глебы, дзярнова-падзолістыя забалочаныя глебы, дзярнова-забалочаныя глебы, поймавыя глебы.* Добра трымаюць вільгаць і ўгнаенні, але лёгка разбураюцца ліўнямі і талымі водамі, маюць павышаную кіслотнасць. На Беларусі найб. урадлівыя, пашараны на Пн. Займаюць каля 30 % с.-г. угоддзяў.

СУД, орган дзяржавы, які ажыццяўляе *правасуддзе* шляхам разгляду і вырашэння ва ўстаноўленым законам працэсуальным парадку крымін., грамадз., адм. і інш. катэгорый спраў. С. падзяляюцца на звычайныя і надзвычайныя (стварэнне апошніх забараняецца амаль усімі сучаснымі канстытуцыямі). Звычайныя падзяляюцца на С. агульнай кампетэнцыі і спецыялізаваныя: ваенныя, арбітражныя (гандлёвыя, гаспадарчыя), мытныя, падатковыя (фінансавыя), па прац. спрэчках і г.д. Асобымі разнастайнасцямі С. з'яўляюцца *канстытуцыйны суд* і адміністрацыйныя С. У некат. краінах існуюць таксама рэлігійныя С. (напр., С. шарыяту ў мусульм. дзяржавах) і С. звычаёвага права (напр., племенныя С. у шэрагу краін Афрыкі і Акіяніі). У дзяржавах з федэратыўным ладам С. падзяляюцца на федэральныя і С. суб'ектаў федэрацыі. С. падзяляюцца таксама па інстанцыях: С. першай інстанцыі, апеляцыйны, касацыйны і наглядны; па тэр. узроўні: напр., раённыя (гарадскія), акруговыя, абласныя, краявыя і вярхоўныя.

С. узнік разам з дзяржавай, але ў самаст. орган вылучыўся ў працэсе развіцця дзярж. механізму і стварэння дзярж. апарата. У дадзярж. грамадстве канфлікты і спрэчкі вырашаліся старэйшынамі або кіраўнікамі плямён, сходамі, радамі, калегіямі. Існавалі звычаі пазасудовага разгляду канфліктаў (*крывавая помста*, прынцып *таліёна* і да т.п.). Цэнтралізацыя суд. сістэмы і ўзмацненне ролі дзяр-

жавы ў дзейнасці С. звязаны з агульным працэсам умацавання цэнтр. улады.

Суд. сістэма Рэспублікі Беларусь уключае С. а г у л ь н ы я [Вярх. суд, абласныя і прыраўнаваны да іх Мінскі гарадскі, раённыя (гарадскія), а таксама ваен. С.], гаспадарчыя (Вышэйшы гасп. суд, гасп. С. абласцей і прыраўнаваныя да іх С., гасп. С. гарадоў і раёнаў) і інш. У сістэме агульных і гасп. С. могуць утварацца спецыялізаваныя С.: па справах непаўналетніх, сямейных справах, адм., зямельныя, падатковыя.

На тэр. Беларусі С. вядомы з даўніх часоў. Найб. старажытны — *копны суд*, які праіснаваў да сярэдзіны 18 ст. Самым высокім суд. органам быў *велікакняжацкі суд*. У 15—17 ст. дзейнічалі агульныя С. для ўсяго насельніцтва і С. для шляхты (*замкавы суд, земскі суд* і інш.). У гарадах дзейнічалі *войтаўска-лаўніцкія суды*. У 1581 створаны *Трыбунал Вялікага княства Літоўскага*, на якім разглядаліся апеляцыйныя скаргі на рашэнні ніжэйстаячых С. і найб. важныя справы. Пасля далучэння да Рас. імперыі на тэр. Беларусі пэўны час дзейнічалі яе С., але паступова суд. сістэма збліжалася з той, што існавала ў Расіі. Пасля адмены ў 1840 дзеяння Статута ВКЛ 1588 на Беларусі пачалі кіраваць агульнарасійскім заканадаўствам і судаводствам. Канстытуцыйны суд *Рэспублікі Беларусь* аднесены да органаў дзярж. кантролю і нагляду. Па сваёй сутнасці гэта орган суд. улады, які ажыццяўляе канстытуцыйнае правасуддзе. Гл. таксама *Суддзя, Судаводства*. *Э.І.Кузьмянкова.*

«СУД БО́ЖЫ», старажытны спосаб судовага доказу, які абапіраўся на ўяўленне пра магчымасць удзелу божаства ў вырашэнні спрэчак, якія ўзнікаюць паміж людзьмі. Вядомы законам *Хамурапі* і *Ману законам*. Быў засвоены ўсімі *варварскімі праўдамі*, *Рускай праўдай*, Законнікам Стафана Душана і інш. Важнейшыя формы «С.б.»: *судовы паядынак* (на Русі «поле»), у якім яго ўдзельнікі мелі аднолькавыя ўмовы; выпрабаванне агнём: той, хто ачышчаўся ад абвінавачання, або трымаў пэўны час руку ў агні, або праходзіў праз агонь у адной кашулі ці рабіў 9 крокаў з распаленым жалезам у руках, або босымі нагамі ступаў па 9 распаленых сашніках; выпрабаванне вадой: або абвінавачаны павінен быў дастаць з кіпячай вады ў катле які.-н. прадмет, або абвінавачанага звязвалі і апускалі ў ваду, калі ён тануў, лічылася за прыкмету яго праўдзівасці, а калі выплываў — наадварот («нават вада не прымае»); выпрабаванне жэрабем, якое часцей ужывалася пры абвінавачанні ў крадзяжах. У 13—14 ст. «С.б.» актыўна выцясняўся з судаводства, аднак яго перажыткі ў Зах. Еўропе захоўваліся да 17 ст. (асабліва па справах аб вядзьмарстве). Найдаўжэй у практыцы захоўвалася цалаванне крыжа, змацаванае клятвай, і жэрабя.

Г.А.Маслыка.

СУД КАРАЛЁЎСКАЙ ЛА́ВЫ, найстарэйшая судовая ўстанова ў Вялікабрытаніі. Вылучаны з каралеўскай рады ў асобую курыю ў 1178, і напачатку суправаджаў каралёў пры іх раз'ездах па краіне. Пазней асн. яго кампетэнцыяй стаў разгляд найважнейшых крымін. спраў. Ён жа ажыццяўляў нагляд за дзейнасцю ніжэйшых судоў. Адыграў важную ролю ў фарміраванні агульнага права, асн. крыніцай якога прызнаваўся суд. прэцэдэнт. З 19 ст. С.к.л. — аддзяленне Высокага суда, пасля рэформы 1971 яго кампетэнцыя абмежавана разглядам цывільна-прававых спрэчак.

«СУД ЛІ́НЧА», гл. *«Лінча суд»*.

СУД ПРЫСЯ́ЖНЫХ, суд, у склад якога акрамя пастаянных суддзяў уваходзяць прысяжныя засядацелі; адзін з найб. дэмакратычных ін-таў судовай сістэмы і ўсёй сістэмы органаў дзярж. улады, які ўвасабляе прынцып непасрэднага ўдзелу народа ў ажыццяўленні правасуддзя. У класічным варыянце складаецца з лавы прысяжных засядацеляў — калегіі з 6, 12 або інш. колькасці грамадзян (адбіраюцца па выпадковай методыцы для дадзенай справы і вырашаюць пытанні факта злачынства) і аднаго ці некалькіх прафес. суддзяў, якія вырашалі пытанні права. Як правіла, С.п. разглядае крымін. справы ў першай інстанцыі. Узнік у Англіі ў 12—15 ст., у Еўропе і некат. інш. частках свету пашырыўся пасля Франц. рэвалюцыі 1789—99. У наш час С.п. існуе ў ЗША, Вялікабрытаніі, Канадзе, Ірландыі, Швейцарыі і інш. У Расійскай імперыі (у т.л. на Беларусі) С.п. існаваў у 1864—1917. З 1993 паэтапна ўводзіцца ў некаторых суб'ектах Рас. Федэрацыі.

СУ́ДАБЛЕ, С у д а б л я, С у д а б л ь, возера ў Смалявіцкім р-не Мінскай вобл., у бас. р. Пліса, за 20 км на У ад г. Смалявічы, за 4 км на ПдУ ад г. Жодзіна. Пл. 1,52 км^2, даўж. 1,5 км, найб. шыр. 1,1 км, найб. глыб. 0,6 м, даўж. берагавой лініі 4,4 км, пл. вадазбору 22 км^2. Катлавіна рэшткавага тыпу. Схілы невыразныя, тарфяныя. Берагі нізкія, пераважна сплавінныя (шыр. сплавіны 50—75 м). Дно выслана сапрапелем. Возера слабапраточнае, зарастае, зімой прамярзае да дна.



Возера **Судабле**.

СУДАВО́ДСТВА, установлены законам парадак узбуджэння, расследавання, судовага разгляду і вырашэння крымін., цывільных і адм. спраў. С. Рэспублікі Беларусь будуецца на дэмакр. прынцыпах: непасрэднасць, вуснасць і бесперапыннасць суд. разбору, *галоснасць судаводства*, нязменнасць складу суда (суддзі) пры суд. разборы, спаборнасць у форме суд. спрэчак, роўнасць правоў бакоў, забеспячэнне правоў абвінавачаных на абарону, вядзенне разбору на бел. або рус. мове (для тых, хто не валодае гэтымі мовамі, павінен быць прадастаўлены перакладчык). Адрозніваюць С. па цывільных і гасп. справах, што адбываецца непасрэдна ў адпаведных судах, і крымін. С., якое ўключае ў сябе не толькі суд. дзейнасць, але і парадак вядзення папярэдняга следства і дазнання. Працэсуальнае заканадаўства вызначае паўнамоцтвы судоў, органаў пракуратуры, папярэдняга следства і дазнання, рэгламентуе правы і абавязкі ўдзельнікаў працэсу. Гл. таксама *Падследнасць*, *Падсуднасць*. *Э.І.Кузьмянкова.*

СУДА́К, кліматычны курорт на Украіне, у Крымскай вобл., на беразе Чорнага мора. Клімат субтрапічны міжземнаморскага тыпу (асн. прыродны лек. фактар). Лечаць захворванні органаў дыхання (нетуберкулёзныя), кровазвароту, нерв. сістэмы. Санаторый, дом адпачынку, пансіянаты.

СУДАКІ́ (Stizostedion, або Lucioperca), род рыб. сям. акунёвых атр. акунепадобных. 5 відаў; 3 — у вадаёмах Еўразіі: С. звычайны (S. lucioperca), С. марскі (S. marinum), берш (S. volgensis); 2 віды ў прэсных водах Паўн. Амерыкі: С. канадскі, або пясчаны (S. canadens), і С. светлапёры, або жоўты (S. vitreum). На Беларусі трапляецца С. звычайны; у многіх вадаёмах акліматызаваны.

Даўж. да 70 (130) см, маса 2—4 (20) кг. Цела прадаўгаватае, сціснутае з бакоў. Рот невял.; на сківіцах і паднябенных касцях ёсць іклы. Бакавая лінія працягваецца на хваставы плаўнік. Кормяцца рыбай. Аб'екты промыслу, развядзення і інтрадукцыі.

СУДАКО́Ў Ілья Якаўлевіч (1.8.1890, Масква — 1.9.1969), расійскі рэжысёр, педагог. Нар. арт. Расіі (1938). З 1916 акцёр і рэжысёр 2-й Студыі Маскоўскага Маст. т-ра, з 1924 і ў 1946—48 — Маскоўскага Маст. акад. т-ра, у 1933—37 узначальваў Маскоўскі трам, у 1937—44 гал. рэжысёр і маст. кіраўнік Малога т-ра, з 1944 у Т-ры-студыі кінаакцёра і інш. маскоўскіх т-рах. У 1952—53 гал.

рэжысёр Бел. т-ра імя Я.Купалы. У 1930—56 праф. Дзярж. ін-та тэатр. мастацтва. Сярод пастановак: «Дні Турбіных» М.Булгакава (1926), «Браняпоезд 14—69» У.Іванава (1927, з Н.Літоўцавай; абодва пад маст. кіраўніцтвам К.Станіслаўскага), «Страх» А.Афінагенава (1931), «Платон Крэчат» А.Карнейчука (1935), «Урыэль Акоста» К.Гуцкава (1940), «Варвары» М.Горкага (1941, з К.Зубавым), «Нашэсце» Л.Лявонава (1943). На бел. сцэне паставіў «Шчасце паэта» В.Віткі (з П.Сушко), «Залп Аўроры» («Кастрычнік») М.Бальшынцова і М.Чыяўрэлі (абодва 1952). Здымаўся ў кіно. Дзярж. прэміі СССР 1942, 1951.

СУДА́Н (ад араб. Білад ас-судан — краіна чорных), прыродная вобласць у Афрыцы ад паўд. межаў *Сахары* да прыэкватарыяльных раёнаў (4—8° паўн. ш.) і ад Атлантычнага ак. да Эфіопскага нагор'я. Працягласць з Пн на Пд больш за 1 тыс. км, з З на У каля 5,5 тыс. км; пл. каля 5 млн. км^2.

Размешчана ў межах *Афрыканскай платформы*. Яе сінеклізам адпавядаюць упадзіны сярэдняга цячэння рэк Нігер, Белы Ніл, катлавіна воз. Чад, запоўненыя антрапагенавымі пясчана-гліністымі адкладамі. Пераважаюць выш. 200—500 м. На З прыбярэжная нізіна Сенегамбіі — апушчаная прыатлантычная ч. платформы (200 м ніжэй узр. м.). Узвышаныя ўчасткі адпавядаюць антэклізам — крышт. плато Джос, Дарфур і часткова перакрытае асадкавай тоўшчай Кардафан з астраўнымі гарамі. Стараж. вулканічныя конусы ў Сенегале і Дарфуры звязаны з неагенавымі разломамі (г. Мара — 3088 м, найб. выш. ў С.). Пашыраны рачныя даліны, сухія і паўсухія рэчышчы часовых вадацёкаў, азёрныя ўпадзіны. Клімат субэкватарыяльны, мусонны. Летам значны ўплыў паўд.-зах. экватарыяльнага мусону, зімой — паўн.-ўсх. гарачага і сухога пасату. Колькасць ападкаў ад 100 на Пн да 2000 мм на Пд за год, вільготны сезон 2—10 мес. На Пд т. зв. зенітальныя дажджы. Сярэднегадавыя т-ры на З 23—24 °С, на У 26—29 °С. Найб. рэкі Ніл з Собатам, Нігер, Сенегал, Гамбія, Шары, Бенуэ, Бахр-эль-Газаль, Белая і Чорная Вольта. У бас. р. Нігер і Бахр-эль-Газаль шмат невял. азёр. Найб. ў С. воз. *Чад* (пл. мяняецца і паступова скарачаецца). З Пн на Пд ярка выражана шыротная занальнасць змены ландшафтаў ад трапічных пустынь Сахары, праз паўпустыні і саванны да гілеяў экватарыяльнай Афрыкі. На Пн паўпустыня і сухая саванна, дзе пераважае калючкава-дрэвавая фармацыя. Кусты акацыі выш. 1—5 м. Большую ч. С. займае тыповая саванна са злакавым покрывам (віды барадачу, выш. 1—1,5 м). Трапляюцца асобныя або групы дрэў (парасонавыя акацыі, пальмы дум і веерная, баабабы, малачаі). На Пд высакатраўная саванна і лесасаванна. Лясныя масівы з густым падлескам прымеркаваны да далін рэк (галерэйныя лясы) і катлавін. Глебы пераважна чырв. фералітныя, алферытныя, чырв.-бурыя, чырв.-карычневыя. Жывёльны свет належыць да Эфіопскай вобласці: антылопы, жырафы, слон, леў, бегемот і інш.; з птушак — страусы, балотны бусел, дрофы і інш. Зона саваннаў — тэр. актыўнага стараж. земляробчага асваення і жывёлагадоўлі. С.-г. дзейнасць прывяла да ўзмацнення працэсаў апустыньвання. На тэр. С. поўнасцю або часткова знаходзяцца дзяржавы: Сенегал, Гамбія, Гвінея—Бісау, Гвінея, Малі, Кот-д'Івуар, Буркіна-Фасо, Гана, Тога, Бенін, Нігер, Нігерыя, Камерун, Чад, Цэнтральнаафр. Рэспубліка, Судан.

М.В.Лаўрыновіч.

СУДА́Н, Рэспубліка Судан (араб. Гумхурыя ас-Судан), дзяржава на ПнУ Афрыкі. Мяжуе на Пн з Егіптам, на З з Лівіяй, Чадам, Цэнтральнаафр. Рэспублікай, на Пд з Дэмакр. Рэспублікай Конга, Угандай і Кеніяй, на У з Эфіопіяй і Эрытрэяй, абмываецца Чырвоным морам. Пл. 2505,8 тыс. км^2. Нас. 34 475,7 тыс. чал. (1999). Дзярж. мова — арабская. Сталіца — г. *Хартум*. Краіна падзяляецца на 26 штатаў. Нац. свята — Дзень незалежнасці (1 студз.).

Дзяржаўны лад. С. — рэспубліка. Дзейнічае канстытуцыя 1998. Кіраўнік дзяржавы і ўрада — прэзідэнт. Вышэйшы прадстаўнічы і заканад. орган. — парламент (Нац. асамблея, 400 дэпутатаў).

Прырода. Тэр. краіны з'яўляецца ўсх. ч. прыроднай вобласці *Судан*. У рэльефе пераважаюць пласкагор'і (выш. 300—1500 м). Значную тэр. займае катлавіна сістэмы р. Ніл. На ПнЗ частка *Сахары* (*Лівійская пустыня*), на Пд ад яе плато *Дарфур* і *Кардафан* з асобнымі гарамі і масівамі (адпаведна да 3088 м і 1460 м). На Пд адгор'і Цэнтральнаафр. нагор'я (г. Кіньеты, 3187 м), на У *Нубійская пустыня* і ўскраіны *Эфіопскага нагор'я*. Ёсць радовішчы золата, азбесту, слюды, гіпсу, нафты, каменнай солі, руд медзі, волава, свінцу, жалеза, хрому, магнію і інш. Клімат пераходны — ад экватарыяльна-мусоннага на Пд да пустыннага трапічнага на Пн. У Хартуме сярэдняя т-ра студз. 23 °С, ліп. — 32 °С. Ападкаў ад 25 мм за год на Пн да 1000—1400 мм на Пд. Гал. р. Ніл з прытокамі.



Судакі: 1 — звычайны; 2 — берш.

Паўд. частка С. ў зоне саваннаў, паўн. — у зонах трапічных пустынь і паўпустынь. У гарах і па далінах рэк на крайнім Пд і У краіны трапічныя і галерэйныя лясы. Пад лесам і хмызнякамі каля 19 % тэр. Жывёльны свет: антылопы, жырафы, сланы, ільвы, леапарды, насарогі, бегемоты, какадзілы; з птушак — страусы, дрофы, марабу; з насякомых на ПдЗ распаўсюджана муха цэцэ. Буйныя нац. паркі — Дындэр, Саўтэрн (Паўднёвы), Німуле, Шамбе; некалькі рэзерватаў.



Герб і сцяг **Судана**.



Насельніцтва. С. — шматнацыянальная краіна, жывуць прадстаўнікі больш як 30 народаў. Каля 45 % складаюць суданскія арабы (пераважна на Пн). На Пд жывуць негроідныя народы ніла-сахарскай моўнай групы (каля 40 %; дзінка, нуэр, бары, фур, шылук, нубійцы) і нігера-кардафанскай сям'і [каля 6 %; азандэ (зандэ) і інш.]. На ўзбярэжжы Чырвонага м. жыве народ беджа (каля 6 %, кушыцкая моўная група). Сярод вернікаў мусульман-сунітаў 70 % (на Пн), прыхільнікаў мясц. традыц. вераванняў 25% і хрысціян 5% (на Пд). Сяроднегадавы прырост 2,7%. Сярэдняя шчыльн. 13,8 чал. на 1 км^2. Найб. шчыльнасць (да 300—400 чал. на 1 км^2) у раёнах арашальнага земляробства вакол Хартума; у Сахары месцамі менш як 1 чал. на 1 км^2. Качавы і паўкачавы лад жыцця ў пустынях і саваннах вядуць каля 30% насельніцтва. Гар. насельніцтва 35% (1999). Найб. гарады (тыс. ж., 1993): Хартум — 2731, Амдурман — 1271, Паўн. Хартум — каля 700. Больш за 200 тыс. ж. у гарадах Порт-Судан, Касала, Вад-Медані, Эль-Абейд. У сельскай гаспадарцы занята 80% працаздольных, у прам-сці і гандлі — 10%, у абслуговых галінах — 10%.

Гісторыя. Тэр. С. заселена чалавекам з глыбокай старажытнасці. Земляробства і жывёлагадоўля ўзніклі на мяжы 5—4-га тыс. да н.э. У 2-й пал. 3-га — 2-м тыс. да н.э. паўн. ч. С. — *Нубія* ўваходзіла ў склад Стараж. Егіпта. З гэтага часу ў Нубіі ўзнікла цывілізацыя Куш, якая існавала да 4 ст. н.э. У 5—6 ст. правіцелі паўн. С. прынялі хрысціянства. Аднак пад націскам арабаў-мусульман да 15 ст. тут зніклі апошнія хрысц. дзяржавы. У 1504 у Сенары створана першая мусульм. дзяржава — султанат Фундж. Да пач. 19 ст. большасць насельніцтва С. ісламізавана, некат. народы паўд. С. захавалі традыц. вераванні і культуру.

У 1821 С. завяваны правіцелем Егіпта *Мухамедам Алі*. У 1881 прапаведнік Мухамед Ахмед (гл. *Махдзі* Суданскі) абвясціў сябе *махдзі* і ўзначаліў *махдзістаў паўстанне*, якое паклала канец тур.-егіпецкаму панаванню і стварыла ў С. тэакратычную незалежную дзяржаву. Паўстанне ў 1898—99 задушылі англічане. У 1899—1955 С. — калонія Вялікабрытаніі (да 1951 фармальна лічыўся англа-егіпецкім кандамініумам). У 1940-я г. склаліся партыі аль-Ума (стаяла за незалежнасць С.) і нац.-юніянісцкая (НЮП; стаяла за саюз з Егіптам).

1.1.1956 абвешчана незалежнасць С. З 1958 усталяваўся рэжым ваен. дыктатуры ген. І.Абуда, які скінуты ў 1964. Аднак і новыя ўрады 1964 і 1965 не здолелі вырашыць наспелыя праблемы. У 1969 ваенныя на чале з Дж. Німейры ажыццявілі дзярж. пераварот; краіна атрымала назву Дэмакр. Рэспубліка С.; яе прэзідэнтам з 1971 стаў Німейры. У 1972 падпісана пагадненне з прадстаўнікамі паўстанцаў паўд. правінцый С. аб пашырэнні самакіравання. У 1973 прынята канстытуцыя, якая дазваляла толькі адну паліт. партыю — Суданскі сацыяліст. саюз (ССС). Увядзенне ў 1983 ісламскага заканадаўства выклікала незадаволенасць немусульм. насельніцтва Пд, дзе аднавіла ўзбр. барацьбу Суданская нац.-вызв. армія. У 1985 ваенныя на чале з ген. С. ад-Дагабам скінулі Німейры, ССС распушчаны, адноўлена дзейнасць інш. паліт. партый; краіна перайменавана ў Рэспубліку С. Па выніках парламенцкіх выбараў у 1986 створаны кааліцыйны ўрад на чале з лідэрам партыі аль-Ума С. аль-Махдзі. Няздольны вырашыць складаныя эканам. праблемы краіны, гэты ўрад скінуты 30.6.1989 у выніку ваен. пераварота з удзелам ісламскіх фундаменталістаў; дзейнасць канстытуцыі і паліт. партый прыпынена. Улада перайшла да Савета камандавання рэвалюцыяй на чале з ген. Х.А. аль-Башыра (з 1998 прэзідэнт С.). Значны ўплыў на ўрад мае ісламская фундаменталісцкая арг-цыя Нац. ісламскі фронт. С. — чл. ААН (з 1956), Арг-цыя афр. адзінства, Лігі араб. дзяржаў. Дыпламат. адносіны з Рэспублікай Беларусь устаноўлены 15.9.1999.



Ландшафт у Сахары, на поўначы Рэспублікі **Судан**.

Гаспадарка. С. — слабаразвітая агр. краіна. Валавы ўнутр. прадукт 31,2 млрд. дол. (1998), каля 930 дол. у год на 1 чал. Удзельная вага сельскай гаспадркі каля 33 %, прам-сці — 17 %, абслуговых галін — 50 %. Дзяржаве належаць чыгункі, сродкі сувязі, гал. арашальныя сістэмы, камунальныя прадпрыемствы, бавоўнаачышчальная прам-сць і шэраг інш. прадпрыемстваў. У сельскай гаспадарцы выкарыстоўваецца каля 128 млн. га зямлі, у т.л. каля 12,5 млн. га пад ворывам і



Рака Ніл на поўдні Рэспублікі **Судан**.

шматгадовымі насаджэннямі (каля 2 млн. га арашаецца), каля 115,5 млн. га пад пашай (саванны і паўпустыні). Пераважае земляробства. На Пн яно засн. на штучным арашэнні водамі Ніла і яго прытокаў, на Пд, дзе ападкаў значна больш, пераважае непаліўное. Вядучая галіна — вырошчванне доўгавалакністай бавоўны на арашальных землях. Акрамя валакна з семя бавоўніку атрымліваюць алей. Гал. бавоўнаводчыя раёны — міжрэчча Белага і Блакітнага Ніла, даліны рэк Атбара, Белы і Блакітны Ніл. Гаспадарку вядуць сяляне на землях, якія яны арандуюць у дзяржавы. У інш. земляробчых раёнах ёсць буйныя ўласнікі, якія таксама здаюць зямлю на ўмовах арэнды. На ўласныя патрэбы вырошчваюць мясц. віды сорга і проса, пшаніцу, кукурузу, рыс, ячмень. Асн. алейныя культуры арахіс і кунжут. Вырошчваюць клешчавіну (алейная і кармавая культура), бабовыя, маніёк, сачавіцу, перац; месцамі — каву і тытунь. Асн. віды с.-г. прадукцыі (сярэдні штогадовы збор у канцы 1990-х г., тыс. т): бавоўна-сырэц — каля 300 (2-е месца ў Афрыцы, пасля Егіпта), сорга — 2500, проса — 250, пшаніца — 500, арахіс — 400, кунжут — 120; цукр. трыснёг — 5 млн. т. Агародніцтва. Садоўніцтва (цытрусавыя, бананы). На Пн культывуюць фінікавую пальму (больш за 2 млн. дрэў, штогадовы збор 100—200 тыс. т), на Пд — алейную пальму. Збор гуміарабіку (каля 50 тыс. т. штогод, больш за 50 % сусв. вытв-сці, гал. чынам з дзікарослых акацый), лісця сены (александрыйскі ліст) і арэхаў пальмы дум. Жывёлагадоўля качавая і паўкачавая на Пн, адгонная на Пд. Пагалоўе (1997, млн. галоў): буйн. раг. жывёлы (пераважна зебу) — 35, авечак — 42,5, коз — 37,5. На Пн развіта вярблюдагадоўля (каля 3 млн. галоў); гадуюць таксама коней, аслоў, мулаў. Птушкагадоўля (у 1997—41 млн. курэй). Рачное і марское рыбалоўства (у 1998 — 48 тыс. т). На Чырвоным м. промысел жэмчугу, каралаў, марскіх губак і чарапах. Паляўніцтва. У лясных раёнах нарыхтоўка драўніны. У прам-сці пераважаюць дробныя прадпрыемствы па перапрацоўцы с.-г. сыравіны, вытв-сці спажывецкіх тавараў і буд. матэрыялаў. Частка прамысл. вытв-сці ў дзярж. сектары. Здабыча жал., хромавай і марганцавай руд, золата, солі з марской вады, буд. матэрыялаў. З 1999 вядзецца здабыча нафты. У 1998 атрымана 1,8 млрд. кВт · гадз электраэнергіі, у т.л. 72 % на ГЭС (на рэках Блакітны Ніл і Атбара), 28 % на цеплавых электрастанцыях. У апрацоўчай прам-сці вылучаюцца харч. (мукамольная, мясаі рыбаперапр., малочная, алейная, цукр., кансервавая), тэкст. (пераважна баваўняная) і гарбарна-абутковая. Развіта бавоўнаачышчальная прам-сць. Ёсць нафтаперапр., металаапр., фармацэўтычныя, шкляныя прадпрыемствы, чыг. і аўтарамонтныя майстэрні, суднабуд. і суднарамонтныя верфі і інш. Асобныя прадпрыемствы выпускаюць запалкі, шкляны і метал. посуд, парфу-

му, мыла і інш. Асн. прамысл. цэнтры: Паўн. Хартум, Хартум, Амдурман, Порт-Судан. Развіты саматужныя промыслы і рамёствы (ганчарны, апрацоўка драўніны, дубленне скур, выраб абутку і нац. адзення, вытв-сць прахаладжальных напіткаў, макароны, вострых прыпраў і інш.). Транспарт чыг., аўтамаб., унутр. водны, марскі. Шырока выкарыстоўваецца гужавы і ўючны транспарт. Даўж. (тыс. км, 1996) чыгунак — 5,5, аўтадарог — 11,9, у т.л. з цвёрдым пакрыццём — 4,3; унутр. водных шляхоў — 5,3, прадуктаправодаў — 0,8. У краіне 35 тыс. легкавых, 40 тыс. грузавых аўтамабіляў і аўтобусаў. Гал. рачныя парты — Хартум, Малакаль, Джуба; марскі порт — Порт-Судан. 63 аэрапорты, у т.л. міжнар. каля Хартума. У 1997 экспарт склаў 594 млн. дол., імпарт — 1,42 млрд. дол. У экспарце пераважаюць бавоўна (23 %), семя кунжуту (22 %), жывёла і мяса (13%), гуміарабік (5 %), арахіс, золата, скуры, фінікі і інш.; у імпарце — харч. прадукты, паліва, спажывецкія тавары, машыны і трансп. сродкі, лекі і інш. Праз С. праходзіць традыц. шлях мусульман-паломнікаў з Зах. і Цэнтр. Афрыкі да святынь Аравіі (даход у 1998 — 8 млн. дол.). Краіна атрымлівае эканам. дапамогу ад міжнар. арг-цый і асобных мусульм. краін (у 1995 — 254,5 млн. дол.). Грашовая адзінка — суданскі фунт.

Архітэктура, выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Ад эпохі неаліту захаваліся гліняныя статуэткі жывёл, ляпная кераміка, наскальныя выявы. У 2-м тыс. да н.э. мастацтва С. развівалася ў рэчышчы стараж.-егіп. культуры, з канца 1-га тыс. да н.э. ў ім пачалі выяўляцца рысы нац. своеасаблівасці: прыземістасць і масіўнасць прапорцый ў архітэктуры, адносная свабода ад канонаў у манум. рэльефах. З 2-й пал. 6 ст. н.э. ўзводзілі хрысц. храмы, архітэктура і насценныя размалёўкі якіх блізкія да *копцкага мастацтва*. Архітэктура Зах. С. 15—16 ст. ў рэчышчы сяродневяковага каменнага дойлідства Усх. Афрыкі (руіны г. Уры і інш.). У жыллёвым будове пераважалі прамавугольныя ў плане хаціны з цэглы-сырцу, на ўзбярэжжы Чырвонага мора — дамы з каралавага вапняку з выступаючымі закрытымі кратамі вокнамі, у негроідных плямён Пд С. — круглыя гліняныя або плеценыя хаціны са стрэхамі з травы. У 20 ст. ў буйных цэнтрах (Хартум і інш.) пашырылася буд-ва еўрап. тыпу. Традыц. віды выяўл. і дэкар.-прыкладнога мастацтва — драўляная скульптура, якая вызначаецца іератызмам і слабай расчлянёнасцю форм, дробная гліняная пластыка; у арабаў Пн С. — філігранныя работы па медзі, серабры, вырабы са скуры; у негроідных народаў Пд — маст. пляценне. З сярэдзіны 20 ст. складваецца нац. школа станковага мастацтва, якая аб'ядноўвае мясц. дэкар. і еўрап. традыцыі: скульптары М.Куа, А.Хамід, жывапісцы Х.Абас, М.А.Бешыр, графік А.А.Борхан і інш.



Вёска на поўдні Рэспублікі **Судан**.

Літ.: Смирнов С.Р. История Судана (1821—1956). М., 1968; Вобликов Д.Р. Судан: история и современность. М., 1984; История Судана в новое и новейшее время. М., 1992.

І.Я.Афнагель (прырода, насельніцтва, гаспадарка), *У.С.Кошалеў* (гісторыя).



Э.**Сударшан**.

СУДА́НСКАЯ ТРАВА́, гл. ў арт. *Сорга*.

СУДА́НСКІЯ АРА́БЫ, народ, асн. насельніцтва *Судана* (каля 13 млн. чал.). Жывуць таксама ў Чадзе (1,29 млн. чал.) і інш. краінах. Агульная колькасць 14,3 млн. чал. (сярэдзіна 1990-х г.). Гавораць на дыялекце *арабскай мовы*. Вернікі — мусульмане-суніты.

СУДАРША́Н (Sudarshan) Энакал Чэндзі Джордж (н. 16.9.1931, Палам, каля г. Котаям, Індыя), індыйскі і амер. фізік-тэарэтык. Чл. Індыйскай нац. АН (1973) і інш. АН. Скончыў Мадраскі (Індыя; 1952) і Рочэстэрскі (ЗША; 1958) ун-ты. У 1952—55 у Ін-це фундаментальных даследаванняў у г. Бамбей (Індыя). З 1959 у Гарвардскім, з 1961 у Рочэстэрскім ун-тах. З 1965 праф. Сіракузскага ун-та (штат Нью-Йорк), з 1969 — Тэхаскага ун-та (г. Остын), у 1984—90 дырэктар Ін-та матэм. навук у г. Мадрас. Навук. працы па фізіцы элементарных часціц, квантавай оптыцы, квантавай тэорыі поля, тэорыі калібровачных палёў. Разам з Р.Ю.*Маршаком* распрацаваў універсальную тэорыю слабых узаемадзеянняў (1957). Выказаў гіпотэзу аб існаванні тахіёнаў — часціц, што рухаюцца са звышсветлавой скорасцю (1962). Сфармуляваў аптычную тэарэму эквівалентнасці (1963).

Тв.: Рус. пер. — Введение в физику элементарных частиц. М., 1962 (разам з Р.Маршаком); Основы квантовой оптики. М., 1970 (разам з Дж.Клаўдэрам); Частицы за световым барьером (разам з О.Біланюком) // Эйнштейновский сб., 1973. М., 1974; Doubt and Certainty. Cambridge, 1999 (разам з Т.Ротманам).

М.М.Касцюковіч.

СУДДЗЯ́, службовая асоба, якая ўваходзіць ў склад пэўных судовых органаў і выконвае функцыі правасуддзя.

У ВКЛ С. былі ўраднікі велікакняжацкай адміністрацыі (цэнтральнай і мясц.); выбраныя ў вызначаным парадку члены аддзеленых ад адміністрацыі *судоў*; феадалы ў адносінах да залежнага насельніцтва, найб. паважаныя сяляне-гаспадары (копныя мужы, *старцы*) — члены самага старажытнага *копнага суда*. Галоўным С. у дзяржаве лічыўся *вялікі князь*. Разам з панамі-радай ён выконваў функцыі правасуддзя ў вышэйшым *велікакняжацкім судзе*. Вял. князь (кароль) разам з сенатарамі з'яўляўся С. соймавага суда, у склад якога выбіраліся і некалькі соймавых паслоў. С. *камісарскага суда* прызначаліся вял. князем або інш. пастаяннымі С. з прадстаўнікоў Рады ВКЛ ці велікакняжацкай адміністрацыі. Членаў Вышэйшага апеляцыйнага суда — *Трыбунала Вялікага княства Літоўскага* — выбірала на дэпутацкіх соймах шляхта. Членаў *земскага суда* (С., *падсудка*, *пісара*) выбірала шляхта павета на элекцыйных соймах. З чатырох вызначаных ёю кандыдатаў (на кожную пасаду) вял. князь зацвярджаў пажыццёва аднаго. Такі ж парадак існаваў і пры выбарах С. *падкаморскага суда* — падкаморыяў. На перыяд бескаралеўя ствараліся *каптуровыя суды*, членамі якіх былі С. павятовых судоў: гродскага, земскага, падкаморскага і некат. інш. ўраднікі. С. *гродскага суда* (замкавага) былі службовыя асобы мясц. адміністрацыі, а таксама прадстаўнікі мясц. шляхты; з 1566 са шляхціцаў прызначаліся С. і пісар. Для гараджан і феадальна-залежных людзей С. былі феадалы і іх ураднікі (гл. *Вотчынны суд*), а таксама асобы мясц. дзярж. і гасп. адміністрацыі. У гарадах ВКЛ, якія атрымалі магдэбургскае права, ствараліся *бурмістраўска-радзецкія суды* і *войтаўска-лаўніцкія суды*. С. *палюбоўнага суда* (кампрамісарскага) выбіраліся бакамі, якія вялі справу. С. *канфедэрацкіх судоў* — канфедэратамі. С. судоў духоўных былі прадстаўнікі духавенства, якія выбіраліся *капітулам*.

У Рэспубліцы Беларусь, паводле Закона «Аб судаўладкаванні і статусе суддзяў у Рэспубліцы Беларусь» ад 13.1.1995, С. з'яўляюцца асобы, надзеленыя ва ўстаноўленым законам парадку паўнамоцтвамі па ажыццяўленні правасуддзя. С. ўсіх судоў Рэспублікі Беларусь валодаюць адзіным статусам. Асаблівасці статуса асобных катэгорый С. вызначаюцца законамі рэспублікі. С. можа быць грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які дасягнуў узросту 25 гадоў, мае вышэйшую юрыд. адукацыю, не ўчыняў ганьбуючых яго ўчынкаў, мае стаж работы па юрыд. спецыяльнасці не менш як 2 гады або прайшоў ва ўстаноўленым парадку стажыроўку на працягу 2 гадоў і здаў кваліфікацыйны экзамен. Пры ажыццяўленні судовай улады С. павінен няўхільна выконваць Канстытуцыю і законы Рэспублікі Беларусь, быць справядлівым і непрадузятым. Пры выкананні сваіх абавязкаў, а таксама ў неслужбовых адносінах С. павінен паззбягаць усяго, што прыніжае аўтарытэт судовай улады, годнасць С. Ён не можа

займацца якой-н. іншай дзейнасцю (акрамя навук. ці педагагічнай, не звязанай з заняццем штатных пасад), быць дэпутатам, ажыццяўляць прадпрымальніцкую дзейнасць, належаць да паліт. партый і масавых рухаў. С. ўсіх судоў нязменныя. Яны не могуць быць пераведзены на інш. пасаду або ў іншы суд без асабістай згоды. Паўнамоцтвы С. не могуць быць спынены інакш, як у парадку і на падставах, устаноўленых законам. С. з'яўляецца недатыкальным і не можа быць прыцягнуты да крымін. адказнасці без згоды органа, які яго выбраў ці прызначыў. Выбраныя і прызначаныя на пасаду С. прыносяць прысягу. *Т.І.Доўнар, Э.І.Кузьмянкова.*

СУДЖА́ЕВА Святлана Георгіеўна (н. 15.9.1951, Мінск), бел. вучоны ў галіне кардыялогіі, псіхафізіялогіі, рэабіліталогіі. Д-р мед. н. (1994). Дачка Г.А.*Суджаева*. Скончыла Мінскі мед. ін-т (1974). З 1979 у БелНДІ кардыялогіі (у 1997—99 нам. дырэктара). З 2000 у Рэсп. навукова-практычным цэнтры «Кардыялогія» (нам. дырэктара). Навук. працы па пытаннях псіхафізіялогіі ў кардыялогіі, рэабілітацыі хворых на інфаркт міякарда, рэгуляцыі мазгавой гемадынамікі ў норме і пры захворваннях сэрца.

Тв.: Повышение эффективности восстановительного лечения больных инфарктом миокарда путем дифференцированного подбора антиангинальных препаратов (у сааўт.) // Кардиология. 1995. Т. 35, № 12; Регуляция мозгового кровотока в норме и при заболеваниях сердца (разам з М.І.Бельскай) // Здравоохранение. 1999. № 4.

СУДЖА́ЕЎ Георгій Аляксандравіч (н. 18.10.1919, г. Астрахань, Расія), бел. вучоны ў галіне эпідэміялогіі. Д-р мед. н. (1973). Бацька С.Г.*Суджаевай*. Скончыў Мінскі мед. ін-т (1945). З 1945 у праціэпідэмічных установах Мінска. З 1960 у БелНДІ эпідэміялогіі і мікрабіялогіі. З 1971 у Бел. рэсп. сан.-эпідэміял. станцыі. Навук. працы па гігіене, эпідэміялогіі, мікрабіялогіі інфекц. хвароб.

Тв.: Об эпидемиологическом значении бактерионосительства на разных этапах борьбы с дифтерией в Белоруссии // Здравоохранение Белоруссии. 1964. № 5.

СУДЖЭ́ННЕ, форма думкі, у якой змяшчаецца сцвярджэнне або адмаўленне чаго-н. адносна прадметаў і з'яў, іх уласцівасцей і сувязей. Складаецца з суб'екта (S; прадмет думкі) і *прэдыката* (P; частка С., у якой сцвярджаецца ці адмаўляецца што-н. адносна прадмета С.) і сімвалічна выяўляецца ў выглядзе формулы S ёсць (не ёсць) P. Паводле якасці адлюстраваных прадметаў вылучаюць сцвярджальныя і адмоўныя С.; паводле колькасці і аб'ёму адлюстраваных прадметаў — адзінкавыя, асобныя і агульныя С.; паводле характару сувязей паміж адлюстраванымі прадметамі і іх уласцівасцямі — умоўныя, раздзяляльныя і катэгарычныя С.; паводле ступені істотнасці для прадмета адлюстраванай уласцівасці — С. магчымасці (праблематычныя), С. рэчаіснасці (асертарычныя) і С. неабходнасці (ападыктычныя). Аснова тэорыі С. закладзена ў *логіцы* Арыстоцеля. У класічнай логіцы паняцце «С.» сінанімічнае *выказванню* і як самаст. аб'ект даследаванняў не вылучалася. Сувязі паміж С. як сродкамі выяўлення ацэначных адносін да пэўных прадметаў даследуюцца ў мадальнай логіцы.

СУДЗЕ́БНІК 1468, першы кодэкс крымінальнага і працэсуальнага права ВКЛ, выдадзены Казімірам IV 29.2.1468. Напісаны на бел. мове суцэльным тэкстам. У 19 ст. падзелены гісторыкамі на 28 ці 25 артыкулаў. Дзейнічаў да выдання *Статута Вялікага княства Літоўскага 1529*. С. вызначаў адзіныя для ўсяго ВКЛ віды пакарання за злачынствы супраць феад. уласнасці, змяняў парадак судаводства па гэтых справах, абмяжоўваў адказнасць жонкі і дзяцей за злачынствы мужа, скарачаў плацяжы на карысць суддзяў, павышаў адказнасць за прытулак бадзягам, прадугледжваў адказнасць за дапамогу пры ўцёках і арганізацыю ўцёкаў чэлядзі і феадальназалежных людзей ад феадалаў. Асн. віды пакарання паводле судзебніка: пакаранне смерцю, грашовыя спагнанні і пабоі.

Публ.: Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные Археографическою комиссиею. Т. 1. СПб., 1846. № 67.

СУДЗЕ́БНІК 1497, зборнік законаў Рус. дзяржавы, накіраваны на ліквідацыю яе феад. раздробленасці і стварэнне агульнарус. права. Яго крыніцамі былі *Руская праўда*, *Пскоўская судная грамата*, звычаёвае права, граматы і велікакняжацкія ўказы, перапрацаваныя дастасоўна да сац.-эканам. змен. Зборнік устанавіў адзіную сістэму дзярж. суд. органаў, вызначыў іх кампетэнцыю і супадпарадкаванне, рэгламентаваў суд. пошліны. Ён пашырыў кола ўчынкаў, якія прызнаваліся крымінальнымі [напр., крамола, «царкоўная тацба» (святатацтва), паклёп], увёў новыя паняцці злачынстваў і асабліва небяспечных злачынстваў, вышуковую форму працэсу. У якасці меры пакарання прадугледжвалася смяротная кара, лупцаванне (біццё бізуном у людных месцах, на таргах). Абмяжоўвалася права сервітутаў, павялічваліся тэрміны іскавай даўнасці ў адносінах да велікакняжацкіх зямель. Парушэнне межавых знакаў на велікакняжацкіх, баярскіх і манастырскіх землях каралася лупцаваннем, за тыя ж учынкі на сялянскіх землях — грашовым штрафам. Судзебнік увёў плату *пажылога* (карыстанне сядзібай) пры адыходзе селяніна ад феадала, устанавіў адзіны для ўсёй дзяржавы тэрмін пераходу сялян ад аднаго ўладальніка да другога — *Юр'еў дзень*.

СУДЗЕ́БНІК 1550, «Царскі судзебнік», юрыдычны дакумент Расіі перыяду саслоўнай манархіі, які садзейнічаў ліквідацыі феад. раздробленасці ў дзяржаве, хаця шэраг яго норм меў кампрамісны характар. Зацверджаны, на думку вучоных, першым на Русі Земскім саборам у 1550. Падставай для яго прыняцця паслужыла неабходнасць кансалідацыі сіл феадалаў для задушэння нар. паўстанняў, абмежавання баярскага самавольства ў судзе і ў кіраванні. Грунтуючыся на *Судзебніку 1497*, а таксама на сумесных рашэннях Івана IV Грознага, баяр і вышэйшага духавенства, С. 1550 скасаваў суд. прывілеі ўдзельных князёў і ўзмацніў ролю цэнтр. дзярж. суд. органаў, устанавіў парадак падачы і разгляду скаргаў на намеснікаў, што забяспечвала кантроль над імі з боку пameснага дваранства і падрыхтоўвала скасаванне сістэмы *«кармлення»*. Упершыню ў гісторыі Расіі закон быў абвешчаны адзінай крыніцай права. С 1550 адлюстроўваў палітыку далейшага запрыгоньвання сялянства, падрабязна вызначыў становішча *кабальных халопаў*, удакладніў парадак выплаты *пажылога*, увёў новую пошліну «за павоз», пацвердзіў *Юр'еў дзень*.

СУДЗЕ́БНІК 1589, зборнік прававых норм Паўн. Памор'я. Афіцыйна не зацверджаны, але служыў кіраўніцтвам для суддзяў Дзвінскай вобл. ў канцы 16 — 1-й пал. 17 ст. Яго крыніцамі паслужылі мясц. звычаёвае права, *Судзебнік 1550* і, як мяркуюць, статутная грамата (не захавалася) цара Фёдара Іванавіча. Зборнік быў спробай прыстасаваць нормы Судзебніка 1550 да спецыфічных умоў паўн. рэгіёнаў Рус. дзяржавы: адсутнасць свецкай феад. уласнасці, перавага чарнасошнага сял. землеўладання з паступовым распадам абшчыны, наяўнасць развітой маёмаснай дыферэнцыяцыі ў асяроддзі гар. і сельскага насельніцтва.

СУДЗІЛО́ЎСКІ Мікалай Канстанцінавіч (псеўд. Русель; 15.12.1850, г. Магілёў — 30.4.1930), дзеяч міжнар. рэв. руху, вучоны-прыродазнавец. Вучыўся ў Пецярбургскім, Кіеўскім і Бухарэсцкім ун-тах, д-р медыцыны (1877). Удзельнічаў у народніцкім руху ў Расіі, адзін з арганізатараў гуртка «Кіеўская камуна» (1873—74), вёў рэв. прапаганду сярод рабочых і сялян на Украіне і ў Паволжы. З канца 1874 за мяжой. З кастр. 1875 у Бухарэсце, адзін з арганізатараў сацыяліст. руху ў Румыніі; значна паўплываў на развіццё рэв. руху ў Балгарыі. З 1881 у краінах Зах. Еўропы, удзельнічаў у выданні і распаўсюджванні рэв. л-ры, быў блізкі да групы «Вызваленне працы», аказваў ёй фін. дапамогу. З 1887 займаўся медыцынай і публіцыстыкай у г. Сан-Францыска. З 1892 на Гавайскіх а-вах, стварыў партыю незалежных і стаў яе яідэрам, у 1900 выбраны чл. сената, у 1901 — прэзідэнтам Гавайскай рэспублікі. З 1903 у Кітаі, спрабаваў арганізаваць напад на акатуйскую катаржную турму ў Забайкаллі з мэтай вызвалення палітвязняў. У рус.-яп. вайну 1904—05 у Японіі, вёў рэв. прапаганду сярод рус. ваеннапалонных, адкрыў, для іх 3 школы; у 1905

спрабаваў арганізаваць паход 60 тыс. рас. узброеных салдат з Японіі ў Расію, каб падтрымаць рэвалюцыю. У Японіі выдаваў рус. газеты «Япония и Россия», «Воля» і «Восточное обозрение». З 1906 у Кітаі, быў знаёмы з *Сунь Ятсенам*, памагаў кіт. рэвалюцыянерам зброяй. З 1921 жыў у Цяньцзіні, атрымліваў пенсію ад сав. ўрада. З яго імем звязаны вядомыя дасягненні ў галіне хірургіі, тэорыі туберкулёзу і інш. хвароб. С. — першы падарожнік-географ, які грун-



М.К.Судзілоўскі.

тоўна пазнаёміў рас. чытачоў з флорай і фаунай астравоў цэнтр. часткі Ціхага акіяна. Аўтар прац па медыцыне, хіміі, філасофіі, сацыялогіі, геаграфіі.

Літ.: Грицкевич В.П. Добрый русский доктор на Гавайях // Грицкевич В.П.Путешествия наших земляков. Мн., 1968; Мельников М.Ф. Из семьи соколиной. Мн., 1973; Иосько М.И. Николай Судзиловский-Руссель. Мн., 1976; Славутыя імёны Бацькаўшчыны. Мн., 2000. Вып. 1. С. 357—368; Мысліцелі і асветнікі Беларусі: Энцыкл. давед. Мн., 1995. С.556—564; Дзюба У.І. Доктар Русель. Мн., 1991.

СУДЗІ́МАСЦЬ у праве, юрыдычныя вынікі, якія звязаны з вынясеннем абвінаваўчага прыгавору і дзейнічаюць пасля адбывання вінаватым устаноўленага пакарання. С. разглядаецца як *абцяжваючая адказнасць, акалічнасць* пры ўчыненні новага злачынства. Наяўнасць С. можа пацягнуць пэўныя абмежаванні ў выбары месца пражывання і месца працы. Паводле КК Рэспублікі Беларусь за асуджаным пры пэўных умовах на працягу тэрміну С. можа ажыццяўляцца *прафілактычнае назіранне* або *прэвентыўны нагляд*. Тэрміны пагашэння С. ўстаноўлены заканадаўствам з улікам характару ўчыненага злачынства, віду і тэрміну пакарання. Пагашэнне або зняцце С. анулюе ўсе прававыя вынікі, звязаныя з С. Гл. таксама *Рэцыдыў злачынстваў*. *Э.І.Кузьмянкова.*

СУДКО́ВА, вёска ў Дварышчанскім с/с Хойніцкага р-на Гомельскай вобл., каля аднайм. вадасховішча, на аўтадарозе Хойнікі—Калінкавічы. Цэнтр калект. с.-г. унітарнага прадпрыемства. За 5 км на З ад горада і 11 км ад чыг. ст. Хойнікі, 108 км ад Гомеля. 590 ж., 233 двары (2001). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

СУДКО́ВА, вадасховішча ў Хойніцкім р-не Гомельскай вобл., за 4 км на З ад в. Судкова. Створана ў 1982. Пл. 1 км^2, даўж. 1,3 км, найб. шыр. 1,1 км, найб. глыб. 4,2 м, аб'ём вады 3 млн. м^3. Даўж. агараджальнай дамбы 4,1 км. Наліўное. Напаўняецца вадой з р. Віць па напорным трубаправодзе пры дапамозе помпавай станцыі, забіраецца вада праз донны водавыпуск у целе дамбы. Вагані ўзроўню вады на працягу года да 2 м. Выкарыстоўваецца для ўвільгатнення с.-г. угоддзяў, рыбагадоўлі.

СУ́ДМАЛІС (Sudmalis) Імант Янавіч (18.3.1916, г. Цэсіс, Латвія — 25.5.1944), адзін з арганізатараў партыз. руху ў Латвіі ў гады Вял. Айч. вайны, у т.л. ў Беларусі (раён Асвея). Герой Сав. Саюза (1957). З 1932 чл. падп. камун. саюза моладзі Латвіі. З 1940 першы сакратар Ліепайскага пав. к-та камсамола і чл. ЦК камсамола Латвіі. У чэрв. 1941 прымаў удзел у абароне Ліепаі, потым у бел. партыз. атрадах (у Асвейскай зоне). Са снеж. 1942 сакратар парт. арг-цыі латв. партыз. спец. атрада, з сак. 1943 — партыз. брыгады. З восені 1943 упаўнаважаны аператыўных груп ЦК КП(б) і ЦК ЛКСМ Латвіі, стварыў і ўзначаліў рыжскі падп. гарком ЛКСМ. У дзень правядзення фашыстамі мітынгу (13.11.1943) арганізаваў у Рызе ўзрыў міны. 19.2.1944 схоплены фашыстамі і пакараны смерцю.

СУ́ДНА, плывучае збудаванне для перавозкі грузаў і пасажыраў, воднага промыслу, здабычы карысных выкапняў, навук. даследаванняў, спорту, ваен. мэт. Рухаюцца па вадзе (надводныя С., у т.л. *глісеры*), пад вадой (*падводныя лодкі, батыскафы*) і над вадой (*судны на паветранай падушцы, судны на падводных крылах*). Бываюць самаходныя (прыводзяцца ў рух *суднавымі рухавікамі* з дапамогай *суднавых рухачоў*) і несамаходныя (*ліхтэры*, баржы). Паводле тыпу гал. энергет. устаноўкі (ЭУ) падзяляюцца на *параходы* (з котлатурбіннай або котламашыннай ЭУ), *цеплаходы* (з дызельнай ЭУ), пара- і газатурбаходы (з *парасілавымі ўстаноўкамі, газатурбіннымі рухавікамі*; гл. *Турбаход*), *электраходы* (з эл. рухавікамі, што сілкуюцца ад уласных крыніц электраэнергіі, у т.л. турба- і *дызель-электраходы*) і *атамаходы* (*з ядзернай сілавой устаноўкай*).







Судны: 1 — рымскае гандлёвае (зернявоз, 50—200-я г. н.э.); 2 — венецыянскае грузавое (неф, 11—14 ст.); 3 — ганзейскае гандлёвае (ког, 14—16 ст.); 4 — першы металічны трансатлантычны параход з вінтавым рухачом «Вялікабрытанія» (1843); 5 — грузапасажырскі атамаход «Саванна» (ЗША, 1959); 6 — круізны 17-палубны суперлайнер «Вояджэр оф зе Сіс» (ЗША, 2000).

Транспартныя С. бываюць грузавыя (*сухагрузныя судны*, у т.л. кантэйнеравозы, рэфрыжэратары, С. з гарыз. грузаапрацоўкай — ролкеры для перавозкі колавай тэхнікі, кантэйнераў і інш. штучных грузаў з пагрузкай і выгрузкай па апарэлях; наліўныя ,— *танкеры* і сухагрузна-наліўныя), пасажырскія і грузапасажырскія. Прамысл. С. абсталёўваюць для лоўлі рыбы, здабычы марскіх звяроў, крабаў, для перапрацоўкі здабычы (*рыбапрамысловыя судны, сейнеры, траўлеры*). Да прамыслова-здабыўных С. адносяць золатаздабыўныя *драгі, кабельныя судны*, нафтабуравыя, лесасплаўныя. Да навукова-даследчых адносяць С. для комплексных акіянічных, геафіз., гідрабіял. і інш. даследаванняў. Сярод спартыўна-турысцкіх С. адрозніваюць *вёславыя судны, ветразевыя судны* і маторныя; трэніровачныя, гоначныя, прагулачныя (гл. *Спартыўныя судны*). Абслуговыя С. забяспечваюць работу С. інш. прызначэння. Гэта *буксірныя судны, брандвахты, ледаколы*, плывучыя *докі* і *маякі*, выратавальныя, гідраграфічныя, днопаглыбныя, бункеровачныя. Ваен. С. падзяляюцца на баявыя (гл. *Карабель ваенны*), ваенна-транспартныя і забяспечвальныя, у т.л. дапаможныя. Асн. ч. С.: корпус (з каркаса, у т.л. *набору*, і абалонкі — вонкавай абшыўкі і насцілу верхняй палубы); суднавыя прыстасаванні (рулявое, якарнае, швартовае, буксірнае, шлюпачнае, грузавое, выратавальнае і інш.); суднавыя сістэмы (трубаправоды і арматура для вадкасцей і газаў, якія забяспечваюць жывучасць судна, эксплуатац., бытавыя і інш. патрэбы, у т.л. проціпажарную бяспеку, водазабеспячэнне, вентыляцыю); сродкі сувязі (візуальныя — флагі, пражэктары; гукавыя — сірэны, тыфоны; радыётэхн. — перадатчыкі, прыёмнікі, тэлекамеры, унутр. радыётрансляцыйная сетка, тэлефоны, перагаворныя трубы і г.д.); навігацыйныя сродкі (*аўтаруляванні, компасы, курсографы, лагі, лоты, радыёлакацыйныя станцыі, секстанты* і інш. *навігацыйныя прылады*). Спецыфічныя ўласцівасці С. — *мараходныя якасці*, якія характарызуюць паводзіны С. ў плаванні і яго бяспеку. Памеры С. вызначаюць яго даўжыня, шырыня, вышыня борта, *асадка*, *водазмяшчэнне* і ўмяшчальнасць, у грузавых таксама *грузападымальнасць* і *грузаёмістасць*. Тэарэт. і практычныя пытанні ваджэння С. вывучае *суднаваджэнне*.

Першымі С. былі *плыты* з дрэў, чароту ці папірусу. З часоў неаліту вядомы драўляныя *лодкі*. У 3-м тыс. да н.э. ў Стараж. Егіпце будавалі С. з прыгнаных і прасмоленых кавалкаў дрэва. У 10 ст. да н.э. ў фінікійцаў ужо меліся асн. элементы канструкцыі С.: *кіль, шпангоўты*, штэўні, абшыўка з дошак. На Пн лёгкія чаўны выраблялі з дрэва, кары, косці і абцягвалі іх скурай (напр., *каякі*). У Міжрэчча з 8 ст. да н.э. вядомы круглыя лодкі (карзіны, абцягнутыя скурай або пакрытыя смалой). У народаў узбярэжжа Індыйскага ак., астравоў Акіяніі і інш. былі пашыраны плыты, вёславыя і ветразевыя С. тыпу *катамаранаў*, у індзейцаў-карыбаў — *пірогі*, у Паўд.-Усх. Азіі — *джонкі*. Ва Усх. Еўропе з 4 ст. будавалі т.зв. набойныя ладдзі, з 11 ст. — насады, з 16 ст. — казацкія чайкі, з 19 ст. — астраханскія бударкі. Суднавымі рухачамі напачатку былі шасты (жэрдкі) і вёслы, з 3-га тыс. да н.э. — *ветразі* (са скуры, трысняговых цыновак, драўляных планак). На вёславых С. ветразі былі дапаможнымі (выкарыстоўваліся толькі пры спадарожным ветры). У 10—13 ст. у Міжземнамор'і, Скандынавіі і Кітаі з'явіліся чыста ветразевыя судны. Яны маглі рухацца і супраць ветру, зменьваючы *галсы*. У 7 ст. з'явіліся універсальныя вёславыя С. — *галеры*, у 16 ст. — *галеасы*, у 17 ст. — *яхты*. З 12—13 ст. у Зах. Еўропе будавалі С., прыдатныя для акіянскіх плаванняў (*каравелы, брыганціны*, нефы і інш.). Найвышэйшага развіцця ветразевыя С. дасягнулі ў 2-й пал. 19 ст.: іх даўжыня да 90 м, грузападымальнасць да 5 тыс. т., скорасць 33 км/гадз і больш (гл. *Барк, Брыг, Шхуна*). Апошнім тыпам ветразевага С. быў *кліпер*. Першае жалезнае С. пабудавана ў 1787 у Вялікабрытаніі (Дж.Уілкінсан). Пазней карпусы пачалі рабіць са сталі (на пачатку кляпаннем, потым зваркай). У пач. 19 ст. з'явіліся параходы, у 1-й пал. 19 ст. на марскіх параходах замест грабных колаў пачалі ставіць *грабныя вінты*. На мяжы 19 і 20 ст. пачалі выкарыстоўваць *паравыя турбіны* і рухавікі ўнутр. згарання (у 1903 у Расіі пабудаваны першы дызель-электраход «Вандал»). Да сярэдзіны 20 ст. з'явіліся С. з энергет. ўстаноўкамі на ядз. паліве (атамаходы).

На Беларусі са стараж. часоў выкарыстоўваліся разнастайныя рачныя С.: лодкі, выдзеўбаныя са ствала дрэва (*камяга, човен, дуб*), з 7 ст. *ладдзі*, з 15 ст. *віцiны*, з 17 ст. *баркі*, з канца 19 ст. *баржы* і інш. Розныя тыпы С. (*байдаркі, брандвахты*, яхты, барліны, баржы, параходы, цеплаходы, С. тыпу «рака-мора» і інш.) выпускалі: *Крычаўская суднаверф*, Пінскі, Рэчыцкі, Гомельскі, Петрыкаўскі суднабудаўніча-суднарамонтныя з-ды (гл. адпаведныя арт. і *Суднабудаванне*). Рамантавалі С. суднарамонтныя майстэрні ў Віцебску, Гомелі, Бабруйску, Петрыкаве. Гл. таксама *Рачны транспарт, Суднаходства*.

Літ.: Рябчиков П.А. Морские суда. М., 1959; Нойкирхен Г. Мореплавание вчера и сегодня: Пер. с нем. Л., 1977; Допатка Р., Перепечко А. Книга о судах: Пер. с нем. Л., 1981; Шапиро Л.С. Самые быстрые корабли. 2 изд. Л., 1989; Бережных О.А. Самые большие корабли: С древнейших времен до наших дней. Л., 1985; Материалы по истории деревянного судостроения, XVIII—XIX вв. М., 1991; Шитарев В.С. Паруса над океаном: Из глубины веков — до наших дней. М., 1996; Макливи Р. Суда на подводных крыльях и воздушной подушке: Пер. с англ. Л., 1981; Суда и судоходство будущего: Пер. с нем. Л., 1981; Перспективные типы судов: Сб. науч. тр. М., 1991.

У.Я.Калаткоў, У.М.Сацута.

СУ́ДНА НА ПАВЕ́ТРАНАЙ ПАДУ́ШЦЫ (СПП), судна, якое ў час руху або спынення прыўзнімаецца над паверхняй вады (грунту, лёду, снегу) паветрам, што напампоўваецца пад днішча. Выкарыстоўваецца з сярэдзіны 20 ст. для перавозкі пасажыраў, грузаў, у ВМФ. Скорасць да 150 км/гадз і больш.

Поласць пад днішчам разам са спец. агароджай пры нагнятанні паветра ўтварае т.зв. паветраную падушку. Ёсць СПП: з гібкай агароджай па ўсім перыметры падушкі, здольная рухацца над вадой і сушай (амфібійныя і інш. судны); з агароджай падушкі ўздоўж бартоў у выглядзе апушчаных у ваду жорсткіх канструкцый — скегаў (скегавыя судны). СПП маюць паветранагнятальныя восевыя або цэнтрабежныя вентылятары, амфібійныя — таксама паветраныя *суднавыя рухачы* (вінты і інш.). Канструкцыя СПП прапанавана ў 1716 швед. вучоным Э.Сведэнбаргам. Прынцып руху на паветранай падушцы абгрунтаваны ў 1927 К.Э.Цыялкоўскім. Першае СПП (тарпедны катэр) пабудавана ў 1916 (Аўстрыя). У СССР першае СПП прайшло выпрабаванне ў 1934—35.

СУ́ДНА НА ПАДВО́ДНЫХ КРЫ́ЛАХ (СПК), судна, корпус якога пры руху падтрымліваецца над вадой гідрадынамічнымі пад'ёмнымі сіламі, што ствараюцца апушчанымі ў ваду крыламі. Выкарыстоўваюцца з сярэдзіны 20 ст. для перавозкі пасажыраў, невял. тэрміновых грузаў, у ВМФ. Скорасць да 100 км/гадз і больш.

Супраціўленне СПК руху рэзка зменшана, што дазваляе значна павысіць скорасць без вял. затрат энергіі. Нерухомае СПК падтрымліваецца на вадзе сіламі плывучасці, пры пэўнай скорасці корпус яго падымаецца над вадой (выхад на крылы). Устойлівы рух СПК дасягаецца аўтам. зменай плошчы і глыбіні апускання нерухомых крылаў або вугла атакі кіравальных крылаў. Патэнт на СПК выдадзены ў 1891 у Расіі Ш. дэ Ламберу. Практычныя работы па стварэнні СПК пачаты ў канцы 1930-х г. у СССР і Германіі. Першае СПК тыпу «Ракеты» на 66 месцаў пабудавана ў 1957. Энергет. ўстаноўка СПК — рухавікі ўнутр. згарання, газавыя турбіны; рухач — грабны вінт, умяшчальнасць да 300 чал., водазмяшчэнне да 250 т. Цеплаходы на падводных крылах «Палессе» выпускаў Гомельскі суднабудаўніча-суднарамонтны з-д.

СУДНАБУДАВА́ННЕ, галіна прам-сці, якая займаецца буд-вам і рамонтам суднаў усіх прызначэнняў. Паводле характару вытв-сці суднабуд. прадпрыемствы падзяляюцца на суднабуд. і суднарамонтныя, паводле арг-цыі вытв-сці — на суднабуд. з-ды, суднабуд. і судназборачныя верфі. Пабудова сучаснага стальнога судна ўключае: падрыхтоўку







Судна на паветранай падушцы: а — схема (разрэз) па паветраным канале (1 — паветраны канал; 2 — нагнятальнік; 3 — паветраная шахта; 4 — ватэрлінія пры непрацуючым вентылятары; 5 — ватэрлінія пры працуючым вентылятары; 6 — паветраная падушка; 7 — адсек плывучасці); б — амфібійны катэр; в — скечавае судна «Арыён».



Судна на падводных крылах: а — схема (1 — падводныя крылы; 2 — стойкі; 3 — ватэрлінія на стаянцы судна; 4 — ватэрлінія на хаду судна); б — рачное пасажырскае судна «Метэор»; в — марскі цеплаход «Віхар».

ліставога і профільнага матэрыялу, выразанне дэталяў корпуса, зварку асобных карпусных канструкцый, зборку ў цэхах секцый і блокаў і мантаж з іх корпуса, спуск судна на ваду, наладку і выпрабаванне суднавага абсталявання і судна ў цэлым.

Існавала яшчэ ў Стараж. Егіпце і Кітаі. У сярэднія вякі судны будаваліся ў краінах Міжземнамор'я, Паўн. Еўропы. У 15—16 ст. С. пачало разгортвацца ў Італіі (Венецыя, Генуя, Неапаль), Партугаліі і Іспаніі, пазней — у Англіі, Галандыі, Францыі і інш. У Расіі значна развілося пры Пятру I: пабудаваны верфі ў гарадах Архангельск, Варонеж, Ціхвін і інш., у 1770—80-х г. — у гарадах Херсон, Мікалаеў, Севастопаль. У 19 — пач. 20 ст. суднабуд. і суднарамонтныя з-ды пабудаваны ў гарадах Пецярбург, Ніжні Ноўгарад, Кранштат, Рыга, Адэса, Баку, Уладзівасток і інш. У 1920—30-х г. у працэсе рэканструкцыі суднабуд. прам-сці пабудаваны новыя заводы ў гарадах Камсамольск-на-Амуры, Находка, Мурманск, Поці і інш. Наладжана буд-ва лесавозаў, груза-пасажырскіх, рэфрыжэратарных і наліўных суднаў, пабудаваны ваен. караблі і падводныя лодкі. З 1950-х г. будуюцца судны змешанага плавання, сухагрузныя, скарасныя на падводных крылах, атамныя ледаколы, плывучыя рыбазаводы і інш. Сусв. С. характарызуецца высокай канцэнтрацыяй у невялікай колькасці краін: ЗША, Францыя, Вялікабрытанія, Іспанія, Германія, Японія, Швецыя і інш. У большасці з іх судны будуюцца гал. чынам (60—70 %) на экспарт.

На Беларусі са стараж. часоў будавалі *ладдзі*, *лодкі*, выдзеўбаныя са ствала дрэва, а таксама баркі (каля Лоева, Мазыра), *віцiны* (Стоўбцы, Новы Свержань), барліны і інш. Першае прадпрыемства па будаванні байдарак і яхтаў з'явілася ў 1785 (*Крычаўская суднаверф*), у 1884 пабудаваны суднабуд. з-д у Пінску, які выпускаў параходы магутнасцю 240 к.с., карпусы для суднаў і інш. (гл. *Пінскі суднабудаўніча-суднарамонтны завод*), у 1900 створаны суднарамонтныя майстэрні ў Віцебску, пазней у Гомелі. У 1918 заснаваны *Гомельскі суднабудаўніча-суднарамонтны завод*. У 1925 пабудаваны суднарамонтныя майстэрні ў Бабруйску (у 1939 рэканструяваны ў суднарамонтны з-д), у 1929 — Петрыкаўская суднабудаўнічая верф, якая у 1974 рэканструявана ў *Петрыкаўскі суднабудаўніча-суднарамонтны завод*, у 1931 *Рэчыцкі суднабудаўніча-суднарамонтны завод* і інш. У перадваенныя гады суднабуд. прадпрыемствы Беларусі выпускалі грузапасажырскія і буксірныя паравыя судны, несамаходныя баржы невялікай грузападымальнасці. У 1920—30-я г. ў Пінску будаваліся і ваенныя судны (кананерскія лодкі, катэры і інш.) для польскай Пінскай флатыліі. У Вял. Айч. вайну ўсе з-ды разбураны. Да 1950 яны былі адноўлены. У 1960—90-я г. суднабудаўнічыя прадпрыемствы Беларусі выпускалі буксірныя і грузавыя цеплаходы, карпусы суднаў тыпу «рака-мора», пасаж. судны розных мадыфікацый, у т.л. на падводных крылах («Палессе»), несамаходныя баржы, грэйферныя земснарады, брандвахты, плаўэлектрастанцыі і інш. У цяперашні час (2002) рэчыцкі з-д па кантракце з галандскай фірмай выпускае карпусы грунтаадвазных баржаў унутр. плавання, Гомельскі з-д — велікагрузны цеплаход — пляцоўку тыпу «рака-мора». Астатнія прадпрыемствы галіны рамантуюць самаходныя і несамаходныя рачныя судны. Гл. таксама *Судна, Судна на паветранай падушцы, Судна на падводных крылах*.

В.С.Сяліцкі.



Да арт. **Суднабудаванне**. Гомельскі суднабудаўніча-суднарамонтны завод. Сухагрузны цеплаход-пляцоўка «Надзея». 2002.

СУДНАВАДЖЭ́ННЕ

СУДНАВАДЖЭ́ННЕ, 1) сукупнасць навук і навуковых дысцыплін для кіравання рухам *судна*. Да С. адносяцца *навігацыя*, *лоцыя*, *гідраграфія*, мараходная астраномія, гідраметэаралогія, тэорыя *дэвіяцыі* магн. компаса, марская практыка. 2) Кіраванне рухам судна на аснове неперарыўнага інстр. або візуальнага кантролю за ўмовамі плавання, курсам судна, яго скорасцю, месцазнаходжаннем, станам. Інструментальны кантроль вядзецца з дапамогай аўтаматызаваных сістэм С. або *навігацыйных прылад* (у т.л. *гіракампасаў*, *лагаў*, *радыёлакацыйных станцый*, *радыёнавігацыйных сістэм*, *радыёпеленгатараў*, *рэхалотаў*, *секстантаў*, дакладных вымяральнікаў часу). Парадак С. прадпісваецца міжнар. і мясц. правіламі.

СУ́ДНАВЫ РУХАВІ́К, рухавік, які забяспечвае рух судна (гал. рухавік) або дзеянне яго электрагенератараў, вентылятараў, помпаў і інш. (дадатковы рухавік). Першым С.р. была *паравая машына*, пасля — *дызель*, *паравая турбіна*, *газавая турбіна*, *электрычны рухавік*, рухавік знешняга згарання (Стырлінга рухавік).

Працуюць С.р. пераважна на вадкім паліве, таксама на ядз. гаручым (*ядзерныя сілавыя ўстаноўкі* т.зв. атамаходаў). Перадача энергіі ад гал. С.р. на *суднавы рухач* — прамая (непасрэднае злучэнне рухавіка з грабным валам), праз рэдуктар (зубчасты або гідраўлічны) або электрычная (ад электрагенератара С.р. да электрарухавіка грабнога вала).

СУ́ДНАВЫ РУХА́Ч, прыстасаванне (*рухач*), якое стварае неабходную для руху судна сілу *цягі*. Прыводзіцца ў дзеянне ад знешніх крыніц энергіі — ветру (*ветразі*, паветраны *ротар*) і ад устаноўленых на судне (*суднавыя рухавікі*). Падзяляюцца на гідраўлічныя (лопасцевыя і гідрарэактыўныя — вёслы на *вёславых суднах*, грабное кола параходаў канца 19 — пач. 20 ст., *грабны вінт*, крыльчаты рухач — верт. ротар з дыскам і лопасцямі-крыламі на ім, вадамётны рухач), паветраныя (*паветраны вінт*), газавадамётныя (выкарыстоўваюць паветраную і вадагазавую сумесь).



Суднавы рухач: 1 — грабное кола; 2 — грабны пяцілопасцевы вінт.

СУДНАМАДЭ́ЛЬНЫ СПОРТ, стварэнне мадэлей суднаў і караблёў для спарт. мэт; адзін з *тэхнічных відаў спорту*. Спарт. мадэлі падзяляюць на класы (паводле класіфікацыі караблёў ваен.-марскога і гандл. флотаў). Самаходныя мадэлі забяспечваюць мікрарухавікамі гумава-мех., інерцыйнымі, паравымі, унутр. згарання, эл. і інш.; ветразямі. Спаборніцтвы падзяляюць на стэндавыя і хадавыя (на дакладнасць руху, хуткасць, манеўранасць і інш.).

Узнік у канцы 19 — пач. 20 ст. на аснове эксперым. суднамадэлявання. Найб. развіты ў Вялікабрытаніі, Германіі, Італіі, Польшчы, Расіі, Францыі, Швейцарыі, Швецыі і інш.

1-ы чэмпіянат на Беларусі адбыўся ў 1949. З 1950 зборная каманда ўдзельнічала ў чэмпіянатах СССР, у 1976 — бронз. прызёр у кл. самаходных мадэлей і яхтаў, 4-е месца ў кл. скорасных, кордавых і радыёкіруемых мадэлей. Сярод бел. суднамадэлістаў найб. вызначыліся Р.*Шайкоў*, А.*Хацько*, А.Місякоў — бронз. прызёр чэмпіянату свету (1997), прызёры чэмпіянатаў Еўропы Дз.Калмыкоў (1994, 1995), У.Храмаў (1995) і інш.

СУДНАПАД'ЁМ, комплекс аперацый па пад'ёме патанулых *суднаў*. Уключае пошук патанулага судна, падрыхтоўку да пад'ёму і ўласна пад'ём, буксіроўку. С. наз. таксама работы па пад'ёме плаваючых суднаў у док для агляду і рамонту і па памяншэнні асадкі для доступу да падводных частак або праводкі па мелкаводдзі.

СУДНАПАДЫМА́ЛЬНІК, падымальнае збудаванне для перамяшчэння суднаў з аднаго б'ефа ў другі. У адрозненне ад шлюзавання (гл. *Шлюз*) судна перамяшчаюць разам з камерай, у якую яно ўвайшло. С. наз. таксама суднарамонтныя *слі́пы* — нахіленыя берагавыя пляцоўкі для спуску суднаў на ваду або пад'ёму іх з вады. Для верт. пад'ёму суднаў выкарыстоўваюцца плывучыя *докі*.

СУДНАХО́ДСТВА, плаванне па водных шляхах розных відаў суднаў, паромаў. Паводле тыпу водных шляхоў адрозніваюць С.: марское, унутранае (рэкі, азёры, каналы), змешанае (рака — мора); у залежнасці ад раёнаў абслугоўвання — кабатажнае (паміж партамі адной краіны), замежнае; па відах — гандлёвае (перавозка грузаў, пасажыраў), прамысловае (промыслы рыбы, марскога звера і інш.). На Беларусі існуе рачное, гандлёвае С. Гл. таксама *Кабатаж*, *Рачны транспарт*.

СУ́ДНІК Міхаіл Раманавіч (21.11.1910, в. Пяцюлёва Полацкага р-на Віцебскай вобл. — 19.12.1995), бел. мовазнавец. Чл.-кар. АН Беларусі (1970), канд. філал. н. (1954). Засл. дз. нав. Беларусі (1980). Скончыў Мінскі пед. ін-т (1938). У 1930—36, 1938—43 настаўнічаў, у 1943—44 нач. упраўлення кадраў Наркамасветы БССР. У 1944—52 навук. супрацоўнік Ін-та мовы, л-ры і мастацтва АН Беларусі. З 1952 у Ін-це мовазнаўства АН Беларусі (заг. сектара, у 1957—83 дырэктар). Даследаванні па бел. лексікалогіі і лексікаграфіі, арфаграфіі, тэрміналогіі, анамастыцы, гісторыі бел. мовазнаўства. Сааўтар «Руска-беларускага слоўніка» (1953), «Беларуска-рускага слоўніка» (1962), «Руска-беларускага слоўніка грамадска-палітычнай тэрміналогіі» (1970), 14-моўнага «Слоўніка славянскай лінгвістычнай тэрміналогіі» (т. 1—2, Прага, 1977—79), «Тлумачальнага слоўніка беларускай мовы» (т. 1—5, 1977—84), «Арфаграфічнага слоўніка» (з М.М.Лобанам; 6-е выд., 1990), «Тлумачальнага слоўніка беларускай літаратурнай мовы» (1996). Старшыня Бел. (1959—85), чл. Міжнар. (1973) камітэтаў славістаў.



М.Р.Суднік.

Тв.: Гісторыя ўзнікнення і этапы развіцця беларускай лексікаграфіі старажытнай пары // Працы Ін-та мовазнаўства АН БССР. 1957. Вып. 4; Слоўнік асабовых уласных імён. Мн., 1965. *М.Н.Крыўко.*

СУ́ДНІКІ, вёска ў Пральніцкім с/с Валожынскага р-на Мінскай вобл. Цэнтр калгаса. За 45 км на ПдУ ад г. Валожын, 50 км ад Мінска, 36 км ад чыг. ст. Койданава. 251 ж., 107 двароў (2001). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

СУДО́ВА-АДМІНІСТРАЦЫ́ЙНАЯ РЭФО́РМА 1889, гл. ў арт. «*Контррэформы*».

СУДО́ВАЕ СЛЕ́ДСТВА, гл. ў арт. *Следства*, *Судаводства*.

СУДО́ВА-ПСІХІЯТРЫ́ЧНАЯ ЭКСПЕРТЫ́ЗА, від *судовай экспертызы*, асн. задача якой вызначэнне псіхічнага стану абвінавачанага ці падазронага (калі існуе сумненне ў яго свядомасці), дзеяздольнасці сведкі, пацярпелага, істца, адказчыка. Праводзіцца паводле пастановы суда або асоб, якія вядуць дазнанне ці следства, з прыцягненнем адпаведных спецыялістаў у стацыянарных або амбулаторных умовах.

СУДО́ВАЯ АБАРО́НА, права грамадзян, а таксама сукупнасць працэсуальных дзеянняў у судзе, накіраваных на абарону гонару і годнасці, жыцця і здароўя, асабістай свабоды і маёмасці ад злачынных пасяганняў, на абвяржэнне абвінавачання або змякчэнне адказнасці абвінавачанага. Гэта права забяспечваецца ўдзелам абаронцы (адваката) у судаводстве па цывільных або крымін. справах. С.а. грамадзянам Рэспублікі Беларусь гарантуецца Канстытуцыяй (арт. 60, 62).

СУДО́ВАЯ ІНСТА́НЦЫЯ, стадыя разгляду судовай справы з пэўнай кампетэнцыяй. У бел. цывільным і крымін. працэсах адрозніваюць *суды* першай, касацыйнай і наглядной інстанцый. Суд 1-й інстанцыі правамоцны на непасрэднае даследаванне і ўстанаўленне ў суд. пасяджэнні акалічнасцей справы і вынясення па ёй адпаведнага рашэння або прыгавору. 2-я С.і. — касацыйная, разглядае справу па касацыйнай скарзе або пратэсце на рашэнні, прыгаворы і прыватныя скаргі (пратэсты) на вызначэнне суда 1-й С. і і пастановы суддзі, якія не набылі законнай сілы. Наглядная С.і. — суд, які разглядае справы па пратэстах на рашэнні, прыгаворы, вызначэнні, пастановы, што набылі законную сілу. *Э.І.Кузьмянкова.*

СУДО́ВАЯ КАЛЕ́ГІЯ, састаў суда, які разглядае канкрэтную справу. У Рэспубліцы Беларусь структурнае падраздзяленне ў Вярх., Бел. ваен., абласных і Мінскім гар. судах. Кожная С. к. разглядае пэўную катэгорыю спраў (крымін. або цывільных). Паўнамоцтвы С. к. вызначаны законам «Аб судаўладкаванні і статусе суддзяў у Рэспубліцы Беларусь» ад 13.1.1995 і працэсуальным заканадаўствам. Работу С.к. накіроўвае нам. старшыні адпаведнага суда.

СУДО́ВАЯ МЕДЫЦЫ́НА, галіна медыцыны, якая распрацоўвае пытанні мед. і біял. характару, што ўзнікаюць у судова-следчай практыцы. Складаецца з працэсуальна-арганізац. раздзела, дзе разглядаюцца змест і тлумачэнне законаў і ведамасных інструкцый, правы і абавязкі, межы кампетэнцыі і адказнасці суд.-мед. экспертаў, арганізацыя суд.-мед. службы, і раздзела, які вывучае тэорыю і практыку суд.-мед. экспертызы — адной з *судовых экспертыз*, вынік якой служыць адной з крыніц суд. доказаў.

СУДО́ВАЯ ПРА́КТЫКА, 1) дзейнасць *судоў* па прымяненні законаў пры вырашэнні канкрэтных спраў. 2) Пэўная тэндэнцыя вырашэння судамі асобных катэгорый спраў з улікам рашэнняў судоў, якія набылі законную сілу, найперш судоў вышэйшых інстанцый. Садзейнічае аднастайнасці ў прымяненні законаў судамі. У Рэспубліцы Беларусь абагульняецца вопыт дзейнасці ўсіх судоў, канкрэтызуюцца асобныя нормы, робяцца ўказанні судам, як правільна разумець і прымяняць законы, на прыкладзе канкрэтных спраў адзначаюцца памылкі судоў пры іх вырашэнні. С.п. адыгрывае важную ролю ва ўдасканаленні заканадаўства, паколькі ў працэсе выкарыстання судамі законаў правяраецца эфектыўнасць дзеючых норм, выяўляюцца хібы, супярэчнасці і інш. не-

дахопы існуючага заканадаўства. Вывучэнне і абагульненне С.п., якім займаюцца ўсе суды, ад Вярх. суда да раённых судоў, дае магчымасць глыбей раскрыць прычыны і ўмовы парушэння законнасці, своечасова паставіць перад адпаведнымі органамі і службовымі асобамі пытанне аб папярэджанні гэтых парушэнняў.

У шэрагу краін С.п. разглядаецца як крыніца права, стварае новыя формы (напр., у форме *прэцэдэнту*).

Э.І.Кузьмянкова.

СУДО́ВАЯ РЭФО́РМА 1864 у Расіі. На аснове судовых статутаў рэформа распрацавала прынцыпы суда і судаводства: абвясціла незалежнасць суддзяў, галоснасць, вуснасць і спаборнасць суд. працэсу, скасавала саслоўны суд; уведзены *суд прысяжных*, адвакатура, *міравыя суды*. Прагрэс. значэнне рэформы заключалася ў стварэнні новай суд. сістэмы, якая замяніла раздробленую сістэму судоў. Былі створаны дзве сістэмы судоў: міравыя (разглядалі дробныя крымін. і цывільныя справы) і агульныя (уключалі акр. суды і суд. палаты). Пры іх знаходзіліся суд. следчыя, суд. прыставы, пракуратура. Вышэйшы нагляд за пракуратурай ажыццяўляў генерал-пракурор (з 1802 ім быў міністр юстыцыі). Вярх. і касацыйным судом, а таксама вышэйшым органам суд. нагляду быў *Сенат*, дзе існавалі 2 касацыйныя дэпартаменты — цывільны і крымінальны.

СУДО́ВАЯ СІСТЭ́МА, сукупнасць усіх *судоў* дзяржавы, якія маюць агульныя задачы і звязаны паміж сабой адносінамі па ажыццяўлённі правасуддзя. Кожнае са звёнаў С.с. ўяўляе сабой сукупнасць судоў аднолькавай кампетэнцыі (гл. *Судовая інстанцыя*). У Рэспубліцы Беларусь С.с. ўстанаўліваецца яе Канстытуцыяй і Законам «Аб судаўладкаванні і статусе суддзяў у Рэспубліцы Беларусь» ад 13.1.1995. Яна складаецца з *Вярхоўнага суда Рэспублікі Беларусь*, абласных, Мінскага гар., раённых (гар.) судоў, Бел. ваен. суда, міжгарнізонных ваен. судоў, *Вышэйшага гаспадарчага суда Рэспублікі Беларусь*, гасп. судоў абласцей і прыраўнаваных да іх судоў, а таксама гасп. судоў гарадоў і раёнаў. Утварэнне надзвычайных судоў у Рэспубліцы Беларусь забаронена. У сістэме агульных і гасп. судоў дапускаецца ўтварэнне спецыялізаваных калегій, а ў выпадках, прадугледжаных заканадаўствам, у сістэме гэтых судоў могуць быць утвораны спецыялізаваныя суды: па справах непаўналетніх, сямейных справах, адміністрацыйныя, зямельныя, падатковыя і інш. Склад і кампетэнцыя ўсіх судоў С.с. вызначаецца заканадаўствам.

Э.І.Кузьмянкова.

СУДО́ВАЯ ЎЛА́ДА, у адпаведнасці з тэорыяй раздзялення ўлад С.ў. — самаст. незалежная сфера публічнай улады (побач з заканадаўчай і выканаўчай). Уяўляе сабой: 1) сукупнасць паўнамоцтваў па ажыццяўленні правасуддзя, г.зн. паўнамоцтваў па разглядзе і вырашэнні крымін., цывільных, адм. і канстытуцыйных спраў (спрэчак), у парадку, ўстаноўленым працэсуальным законам, а часам і паўнамоцтваў па абавязковым тлумачэнні норм права (напр., *Канстытуцыйны суд Рэспублікі Беларусь*), нарматворчых і кантрольных паўнамоцтваў (напр., праверка законнасці арышту або затрымання) і інш. другарадных паўнамоцтваў; 2) сістэму дзярж. органаў, якія ажыццяўляюць вышэйпералічаныя паўнамоцтвы. Паўнамоцтвы С.ў. падзяляюцца на асноўныя (выключныя) — па ажыццяўленні правасуддзя і дапаможныя. У дэмакр. дзяржавах С.ў. ўскладаецца на суды розных катэгорый (агульнай кампетэнцыі і спецыялізаваныя, адм. і канстытуцыйныя). У Рэспубліцы Беларусь асн. паўнамоцтвы С.ў. ажыццяўляюць *суды*, у т.л. аднаасобна *суддзі*.

Э.І.Кузьмянкова.

СУДО́ВАЯ ФАТАГРА́ФІЯ, галіна крыміналістычнай тэхнікі, якая вывучае і распрацоўвае сістэму фатаграфічных сродкаў, метадаў, прыёмаў і правіл, што выкарыстоўваюцца пры правядзенні следчых дзеянняў, аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў і судовых экспертыз з мэтай адлюстравання і даследавання аб'ектаў. С.ф. пры яе правільным працэсуальным афармленні мае значэнне доказаў. У пратаколе следчага дзеяння, якое суправаджалася фатаграфаваннем, адзначаецца факт і аб'ект здымкі, метад і ўмовы здымкі.

СУДО́ВАЯ ЭКСПЕРТАЛО́ГІЯ, навуковая дысцыпліна, якая вывучае заканамернасці фарміравання і развіцця тэарэт. асноў *судовай экспертызы*, яе асобных відаў. Знаходзіцца на стыку юрыд. і неюрыд. (прыродазнаўчых, тэхн. і інш.) навук, фарміруе задачы тэарэт. характару і практычнага зместу: магчымасці асобных відаў суд. экспертызы, навук. арганізацыя працы экспертаў, экспертная прафілактыка і інш.

СУДО́ВАЯ ЭКСПЕРТЫ́ЗА, даследаванне, якое праводзіцца экспертам у парадку, прадугледжаным працэсуальным заканадаўствам, для ўстанаўлення па матэрыялах крымін., цывільнай або гасп. справы фактычных даных і акалічнасцей. Падставай для правядзення С.э. з'яўляецца пастанова асобы, якая вядзе следства або дазнанне, пракурора, вызначэнне суда. У працэсе С.э. на аснове спец. ведаў, неабходных для экспертызы па канкрэтнай справе, устанаўліваюцца факты, акалічнасці. С.э. вызначаецца пытаннямі, якія ставяць следчы або суд. Аб'ектам С.э. могуць быць рэчавыя доказы, месца здарэння, параўнальныя ўзоры і г.д. С.э. праводзіцца з дапамогай пэўных прыёмаў, з выкарыстаннем розных тэхн. сродкаў, з улікам прадмета экспертызы. Адрозніваюць экспертызы крыміналістычныя, мед. і псіхіятрычныя (гл. *Судова-псіхіятрычная экспертыза*), біял., фін.-эканам., аўтатэхн., пажарна-тэхн., буд. і інш.

Э.І.Кузьмянкова.

СУДО́ВЫ ВЫКАНА́ЎЦА, службовая асоба, якая ажыццяўляе прымусовае выкананне рашэнняў, вызначэнняў і пастаноў па судовых справах у частцы маёмасных спагнанняў, інш. рашэнняў і пастаноў у прадугледжаных законам выпадках. У Рэспубліцы Беларусь С.в. ўваходзіць у склад апарата суда і падпарадкоўваецца яго старшыні. Парадак назначэння С.в., іх правы і абавязкі вызначаюцца заканадаўствам.

СУДО́ВЫ ПАЯДЫ́НАК, у сярэдневяковым судовым працэсе спосаб вырашэння спрэчак шляхам узбр. барацьбы спрэчных бакоў. Рэгламентаваны Бургундскай і Рыпуарскай праўдамі (гл. *Варварскія праўды*), *Саксонскім зярцалам* і інш. тагачаснымі юрыд. крыніцамі. На Русі ў 13—16 ст. С.п. меў назву «поле». С.п. звычайна назначаўся паміж: спрачальнікамі; спрачальнікам і сведкам, чые паказанні спрачальнік лічыў ілжывымі; спрачальнікам і суддзёй, які, на думку першага, вынес несправядлівы прысуд. Саслоўныя адрозненні вызначалі выбар зброі: знатныя змагаліся на мячах, простыя людзі — на дубінках. Лічылася, што прайграў працэс той, хто першы ўпусціў зброю, або чыя кроў пралілася раней. Першыя абмежаванні С.п. былі ўведзены ў Англіі ў 12 ст., аднак перажыткі яго існавалі ў Еўропе амаль да 17 ст.

Г.А.Маслыка.

СУДО́ВЫ ПРЫ́СТАЎ, службовая асоба судовага *выканаўчага вядзення*, у абавязкі якой уваходзяць ажыццяўленне прымусовага выканання суд. рашэнняў па цывільных і гасп. справах, а таксама назіранне за захаваннем парадку ў час суд. пасяджэнняў. Пасада С.п. ў Рэспубліцы Беларусь прадугледжана Законам «Аб судаўладкаванні і статусе суддзяў у Рэспубліцы Беларусь» ад 13.1.1995.

СУДО́ВЫЯ ВЫДА́ТКІ, сумы, патрачаныя ў сувязі з разглядам судовай справы. Па грамадз. і гасп. справах складаюцца з дзярж. пошліны па іскавых заявах і касацыйных скаргах, сум, што належаць аплаце сведкам і экспертам, на правядзенне агляду на месцы і выкананне рашэнняў суда, выдаткаў на пошукі адказчыка і інш. Паводле заканадаўства Рэспублікі Беларусь С.в. спаганяюцца з *адказчыка* або з *істца*, калі яго дамаганні прызнаны неабгрунтаванымі. С.в. па крымін. справах спаганяюцца з *асуджаных* або могуць быць аднесены на кошт дзяржавы ў выпадку прызнання апошніх неплацежаздольнымі. Па шэрагу катэгорый грамадзянскіх спраў (аліментныя, працоўныя і інш.) істцы ад аплаты С.в. вызваляюцца.

СУДО́ВЫЯ ПРАЦЭ́СЫ НАД ВАЕ́ННЫМІ НЯМЕ́ЦКА-ФАШЫ́СЦКІМІ ЗЛАЧЫ́НЦАМІ І ІХ ПАМАГА́ТЫМІ, пакаранне асоб, вінаватых у зверствах і забойствах мірных жыхароў,

ваеннапалонных і інш. цяжкіх злачынствах супраць чалавецтва ў Вял. Айч. вайну. Урад СССР праз дыпламат. каналы і ноты Наркамата замежных спраў з 25.11.1941 раскрываў усяму свету праўду пра палітыку *генацыду*, якую праводзіў германскі фашызм на акупіраванай тэрыторыі. Выяўленне звестак пра злачынствы ням.-фаш. захопнікаў праводзіла *Надзвычайная дзяржаўная камісія*. Першыя суд. працэсы над катамі з *СД, СС, гестапа* і здраднікамі Радзімы адбыліся ў 1943 у г. Краснадар, Краснадон, Харкаў. У жн. 1945 створаны Міжнар. ваен. трыбунал і аддадзены пад суд гал. ваен. злачынцы (гл. *Нюрнбергскі працэс*). На Беларусі суд. працэсы адбыліся: 15—29.1.1946 у Мінску (асуджаны 18 ваеннаслужачых ням. арміі), 13—20.12.1947 у Гомелі (16 ваеннаслужачых ням. арміі), 28.10—4.11.1947 у Бабруйску (21 ваеннаслужачы ням. арміі), у ліст. 1947 у Віцебску (10 ваеннаслужачых ням. арміі). Суд. працэсы над вінаватымі ў злачынствах на тэр. Беларусі адбыліся таксама ў 1945 у Бранску, у 1946 і 1961 у Рызе, у 1963 у Кобленцы (Германія) і інш. 26.11.1968 23-я сесія Ген. Асамблеі ААН прыняла канвенцыю аб непрымяненні тэрміну даўнасці да ваен. злачынцаў і злачынстваў супраць чалавецтва. Таму суд. працэсы праводзяцца ва ўсіх выпадках устанаўлення факта падобнага злачынства.

У.І.Лемяшонак.

СУ́ДРАБКАЛН (Sudrabkalns) Яніс (сапр. Судрабкалнс Арвід, да 1923 Пейне Арвід; 17.5.1894, с. Інчукалнс Рыжскага р-на, Латвія — 4.9.1975), латышскі паэт. Засл. дз. культ. Латвіі (1943). Нар. паэт Латвіі (1947). Акад. АН Латвіі (з 1973). Герой Сац. Працы (1974). Друкаваўся з 1909. Выступіў як рамантык (зб. «Крылатая Армада», 1920). Зб-кі вершаў «Пераўтварэнні» (1924), «Ліхтар на ветры» (1931) адметныя эмацыянальнасцю і інтэлектуальнасцю, віртуознасцю формы. Гумарыст. і сатыр. вершы ў зб-ках «Трубадур на асле» (1921), «Джэнтльмен у бэзавым фраку» (1924). Паэт. зб-кі «У братняй сям'і» (1947, Дзярж. прэмія СССР 1948), «Яшчэ адна вясна» (1964, Дзярж. прэмія Латвіі 1965), «Ясень за акном» (1969), «Летуценнікам» (1974) прасякнуты грамадз. матывамі. Аўтар кніг лірычных мініяцюр, публіцыстыкі. Пераклаў на лат. мову верш Я.Купалы «Абвілася краіна». Аўтар верша «Памяці Купалы». Сярод перакладчыкаў яго вершаў на бел. мову Э.Агняцвет, П.Броўка, С.Блатун, С.Гаўрусёў, С.Грахоўскі, А.Звонак, В.Зуёнак, А.Кудравец, Е.Лось, М.Танк, Г.Шаранговіч і інш.

Тв.: Бел. пер. — Яшчэ адна вясна. Мн., 1969; У кн.: Латышская савецкая паэзія. Мн., 1984. Т. 1; У кн.: Песня Даўгавы. Мн., 1986; Рус. пер. — Избранное. М.; Л., 1948; Стихи. М., 1964; Две новеллы. Рига, 1971.

Літ.: Трофимов Р. Путь поэта. Рига, 1964.

М.Абала.

СУДЭ́ТЫ (польск. і чэш. Sudety, ням. Sudeten), горы ў Польшчы, Чэхіі і Германіі. Даўж. каля 300 км. Выцягнуты з ПнЗ на ПдУ ад р. Лаба (Эльба) да Маравскіх Варот. Абрамляюць з ПнУ Чэшскі масіў. Утвораны ў эпохі герцынскай і альпійскай складкавасцей. Складзены пераважна з гранітаў, гнейсаў, сланцаў, мелавых пясчанікаў, мергеляў. Утвараюць сістэму з некалькіх паралельна выцягнутых хрыбтоў (горы Соўі, Бастшыцкія, Орліцкія, Сталовыя), раздзеленых тэктанічнымі далінамі. Пераважаюць выш. 500—1000 м. Схілы стромкія, вяршыні б.ч. згладжаныя. Найб. высокі хр. Крконашы (г. Снежка, 1602 м) з ледавіковымі формамі рэльефу (цыркі, кары, марэнныя азёры). Радовішчы бурага вугалю, шкловых пяскоў, па разломах шматлікія выхады мінер. крыніц. Ападкаў 800—1200 мм і больш за год. Сярэднія т-ры ў студз. ад -4 °С да -17 °С, ліп. 8—14 °С. Зімой утвараецца ўстойлівае снегавое покрыва. У С. вытокі рэк Лаба (Эльба), Марава, Одра, Бубр, Нейсе і інш. Падножжа і схілы да выш. 1000 м параслі дубова-букавымі, вышэй — піхтава-яловымі лясамі, з выш. 1250 м — зараснікі хваёвага сланіку, лугі, тарфянікі. Крконашскі нац. парк. Курорты. Турызм.

М.В.Лаўрыновіч.



Я.Судрабкалн.

СУ́ЗА, Соўза (Sousa) Джон Філіп [сапр. Окс (Ochs) Зігфрыд; 6.11.1854, Вашынгтон — 6.3.1932], амерыканскі дырыжор, кампазітар, скрыпач; адзін са стваральнікаў амер. камічнай оперы і аперэты, заснавальнік нац. стылю музыкі духавых аркестраў. Вучань Дж. Эспуты і Дж.Ф.Бенкерта. З 1867 у аркестры амер. флоту «Мэрыне бэнд» (у 1890—92 яго кіраўнік), з 1871 узначальваў аркестр «Т-ва вадэвіляў» у Вашынгтоне. У 1892 заснаваў уласны аркестр. Пераўтварыў духавы аркестр (бэнд) з акампаніруючага калектыву ў самаст. канцэртны ансамбль. Стварыў якасна новы тып гучання духавога ансамбля, які па насычанасці наблізіўся да сімф. аркестра. Вынаходнік меднага духавога басовага інструмента — сузафона. Аўтар маршаў (больш за 130; яго называлі «каралём маршаў»), якія ўключаюць элементы сімф. развіцця, спалучаюць традыц. маршавыя рытмы *рэгтайма* і уанстэпа. Сярод твораў: 12 опер і аперэт, у т.л. камічная опера «Капітан» (паст. 1895), праграмныя п'есы і танцы для бэнда, каля 70 песень. Аўтар 3 раманаў, аўтабіяграфіі, артыкулаў.

СУ́ЗДАЛЬ, горад, раённы цэнтр ва Уладзімірскай вобл. Расіі, на р. Каменка. 12,1 тыс. ж. (1996). Прам-сць: харч. (малочны з-д, хлебакамбінат), лёгкая (швейная ф-ка). Адзін з цэнтраў турызму. НДІ сельскай гаспадаркі.

Узнік у 9—10 ст. на месцы паселішча фінаугорскага племя мера. Упершыню ўпамінаецца ў Лаўрэнцьеўскім летапісе пад 1024; як горад-крэпасць вядомы з 1096. У 1-й пал. 12 ст. сталіца Растова-Суздалькага княства, потым у складзе Уладзіміра-Суздальскага княства. З 13 ст. сталіца Суздальскага княства. У 1238 спалены мангола-татарамі, супраць якіх у 1262 паўсталі жыхары С. У 1392 падпарадкаваны Маскве. У 1565 горад уключаны *Іванам IV* Грозным у *апрычніну*. У 14—15 ст. адзін з цэнтраў *Суздальска-Ніжагародскага княства*. У 1608 горад 8 мес. знаходзіўся ў руках прыхільнікаў *Лжэдзмітрыя II*. У 1634 спалены крымскімі татарамі. Адзін з рэліг. цэнтраў (у канцы 17 — пач. 18 ст. тут знаходзілася мітраполія, да 19 ст. — епархія). З 1708 у складзе Маскоўскай правінцыі, з 1778 павятовы горад, з 1796 ва Уладзімірскай губ.

Помнікі на тэр. крамля: сабор Раства Багародзіцы (1222—25, не раз перабудаваны, фрэскі 13,15, 17 ст., іканастас 17 ст.; узор *Уладзіміра-Суздальскай школы дойлідства*), архірэйскія палаты (15—18 ст.), шатровая званіца (1635). У цэнтры і на ўскраінах С. манастыры: *Суздальскі Спаса-Яўфім'еў манастыр*, Рызапаложанскі (16—19 ст., сабор 16 ст., галерэя; цвінтар і 2-шатровыя «Святыя варо-



Суздаль. Комплекс Пакроўскага манастыра.

ты», 1688) і Пакроўскі (16—19 ст., сабор 1510—18, надбрамная Дабравешчанская царква 1518); прыходскія цэрквы: Лазараўская (1667), Барысаглебская (17—18 ст.), Цараканстанцінаўская (1707), Косьмадзям'янская (1725) і інш. Захаваліся каменныя і драўляныя дамы 18—19 ст. з ажурнай разьбой, гандл. рады (пач. 19 ст.). У 1950—80-я г. праведзены рэстаўрацыйныя работы, у С. перавезена некалькі драўляных цэркваў 18—19 ст. Многія помнікі і ўсе музеі С. ўваходзяць у склад Уладзіміра-Суздальскага гіст.-маст. і арх. музея-запаведніка. За 4 км ад С. — с. Кідзекша з арх.-маст. помнікамі 12—18 ст. Помнікі архітэктуры С. ўключаны ЮНЕСКА у спіс *Сусветнай спадчыны*.

Літ.: Варганов А.Д. Суздаль: Очерки по истории и архитектуре. Ярославль, 1971; Суздаль: Путеводитель. М., 1985.

княства ў гэты час распалася на шэраг удзелаў, якія ў сярэдзіне 15 ст. далучаны да Масквы.

СУ́ЗДАЛЬСКІ СПА́СА-ЯЎФІ́М'ЕЎ МАНАСТЫ́Р, архітэктурны ансамбль 16—17 ст. у г. *Суздаль* (Расія), на левым беразе р. Каменка. Першапачатковы драўляны Спаскі манастыр засн. ў 1352 суздальскім кн. Канстанцінам Васілевічам. Гал. яго збудаванне — 5-купальны Праабражэнскі сабор (1564), аздоблены вонкавай размалёўкай 1689 (кастрамскія майстры Г. Нікіцін, С.Савін); мае 3 прытворы, аб'яднаныя галерэяй. У 19 ст. да паўн. фасада прыбудаваны прыдзел з цыліндрычным барабанам. У родавай пахавальні сабора магіла кн. Дз.*Пажарскага*, над якой у 1885 узведзены маўзалей. На тэр. манастыра цэрквы: Успенская трапезная (1525; найб. ранні ўзор рус. архітэктуры шатровага тыпу); Дабравешчання (пач. 16 ст.), Нікольская (1669) з 2-павярховай трапезнай; 3-ярусная 3-пралётная званіца (16—17 ст.) і палаты архімандрыта (17—18 ст.). Манастыр абкружаны магутнымі крапаснымі сценамі (узведзены ў 1664, даўж. больш за 1 км) з 12 вежамі. С.С.-Я.м. уключаны ЮНЕСКА у спіс *Сусветнай спадчыны*. *Г.А.Лаўрэцкі.*



Суздаль. Сабор Раства Багародзіцы.



Суздальскі Спаса-Яўфім'еў манастыр. Званіца.

СУ́ЗДАЛЬСКА-НІЖАГАРО́ДСКАЕ КНЯ́СТВА, княства Паўн.-Усх. Русі ў 14—15 ст. Займала тэр. па рацэ Ірміс, Нерль Клязьмінская, ніжніх цячэннях Клязьмы і Акі, сярэднім цячэнні Волгі (да р. Сура). Асн. цэнтры — Суздаль, Ніжні Ноўгарад, Гарахавец, Гарадзец, Курмыш. Утварылася ў 1341, калі мангола-татары перадалі суздальскаму князю Канстанціну Васілевічу Ніжні Ноўгарад і Гарадзец. Каля сярэдзіны 14 ст. сталіца княства перанесена з Суздаля ў Ніжні Ноўгарад. Князі Канстанцін Васілевіч і яго сын Дзмітрый вялі барацьбу з маскоўскімі князямі за вял. княжанне Уладзімірскае, у 1360 і 1363 Дзмітрый ненадоўга захапіў вял. княжанне. У 1364—82 ён дзейнічаў як саюзнік маскоўскага князя. У 1382 ніжагародскія князі ўдзельнічалі ў нападзе Тахтамыша на Маскву. У 1392 маскоўскія князі захапілі Ніжні Ноўгарад і з таго часу ўтрымлівалі Сярэдняе Паволжа ў сваіх руках. Князі С.-Н.к. пры дапамозе мангола-татар дамагаліся вяртання Ніжняга Ноўгарада ў 1395, 1411—14, 1440-я г. Уласна Суздальскае

СУЗІРА́ННЕ, непасрэднае зрокавае ўспрыняцце прадметаў; пачуццёвы спосаб *пазнання*. У псіхалогіі вызначаецца як цэласна-інтуітыўнае паглыбленне ў прадмет, у эстэтыцы — як спецыфічны від духоўна-эстэт. дзейнасці, творчы працэс, пры якім суб'ект атрымлівае асалоду ад прадмета С. і ад самога працэсу С. У філасофіі вылучаюцца 2 асн. тлумачэнні С.: як звышпачуццёвае пазнанне ідэй, якое адкрывае перад чалавекам ісціну (Платон, І.Фіхтэ, Ф.Шэлінг, А.Шапенгаўэр), і як уяўленне пра адзінкавы прадмет, супрацьлеглае мысленню і адчуванню, якое патрабуе дадатковай катэгарыяльнай даапрацоўкі (І.Кант). Ням. фенаменолаг Э.Гусерль адрозніваў 2 тыпы С.: эмпірычнае (уяўленне пра адзінкавы прадмет) і эйдатычнае (спасціжэнне сутнасці з'яў).

«СУЗО́Р'Е», бел. рок-група. Створана ў 1977 на базе аднайм. камсамольска-маладзёжнай кавярні Мінска, з 1981 у складзе Бел. філармоніі. Маст. кіраўнік і гукарэжысёр У.Пучынскі. З 1983 вак.-інстр. ансамбль пад кіраўніцтвам А.Несцяровіча. З 1986 аднавіла дзейнасць як «С.». У першым складзе: У.Пучынскі, Ан.Казлоўскі і В.Пучынскі (гітара), А.Філатаў (барабан). У розныя гады ў склад ансамбля ўваходзілі В.Аліпава, А.Брынцаў, Н.Дзянісава, Вольга Нікалаеня (вакалісты), Ал.Казлоўскі (бас-гітара), А.Растопчын (гітара), А.Несцяровіч і Вас.Нікалаеня (піяніна). Для «С.» характэрна экспрэсная манера выканання, разгорнутыя аранжыроўкі. Рэпертуар складаўся з уласных твораў, твораў прафес. аўтараў. Упершыню ў бел. поп-музыцы звярнулася да «*Полацкага сшытка*», паэзіі Міколы Гусоўскага («Песня пра зубра» Несцяровіча і Ан.Казлоўскага). Сярод папулярных песень: «На шляху дзікіх гусей» У.Будніка, «Стары мост», «Вясенні дзень», «Капітан», «Ва ўсе часы» В.Пучынскага. Выпусціў магнітаальбом «Рок-тэрапія»



Рок-група «**Сузор'е**». 1978.

(1984), міньён «Сузор'е» (1986), альбом «Вераснёўская рака» (1987). Гран-пры Усесаюз. конкурсу паліт. песні (1978, Рыга), дыпламант Усесаюзнага конкурсу «Крымскія зоры» (1981, Ялта).

Дз.А.Падбярэзскі.

СУЗО́Р'І, участкі *зорнага неба*, на якія яно падзелена для зручнасці арыентавання на нябеснай сферы. У старажытнасці С. наз. толькі характэрныя фігуры, утвораныя яркімі зоркамі. Назвы С. звязаны з грэч. ці рым. міфалогіяй (напр., *Андрамеда, Персей*), з земляробствам, жывёлагадоўляй, паляваннем (напр., *Валапас, Заяц*), з падарожжамі, тэхнікай (напр., *Секстант, Мікраскоп*) і інш. Канчатковая колькасць і межы С. вызначаны на Міжнар. астр. з'ездзе ў 1922. Зорнае неба падзелена на 88 участкаў — С., межы праходзяць па нябесных мерыдыянах і паралелях, г.зн. да С. адносяцца як яркія зоркі, што ўтвараюць характэрную фігуру, па якой звычайна распазнаецца С., так і слабыя зоркі, у т.л. нябачныя простым вокам. Гл. таксама *Зорнае неба, Задыяк*.

СУ́ЗЫ (эламскае Шушан, сучаснае Шуш), старажытны горад, сталіца дзяржавы *Элам*. Руіны каля 20 км на ПдЗ ад г. Дызфуль (тэр. сучаснага Ірана). У 1-й пал. 3-га тыс. да н.э. С. — значны паліт. і эканам. цэнтр, пра што сведчаць выяўленыя ў выніку раскопак грабніцы цароў, вял. колькасць прылад працы, зброя, вырабы з золата. У 2-й пал. 3-га — 1-й трэці 1-га тыс. да н.э. С. — сталіца Элама. У 645 да н.э. зруйнаваны сірыйскім царом *Ашурбаніпалам*. Пасля завявання персамі (сярэдзіна 6 ст. да н.э.) стала зімовай рэзідэнцыяй *Ахеменідаў*, потым (з 4 ст. да н.э.) іх пераемнікаў — *Аляксандра Македонскага* (у гэты час горад развіваўся на ўзор грэч. *поліса*) і *Селеўкідаў*. У 640-я г. н.э. С. разбураны араб. заваёўнікамі. Як неўмацаванае паселішча горад існаваў некалькі стагоддзяў, потым заняпаў.

Руіны С. маюць выгляд 4 узгоркаў: «узгорак акропаля» на Пд (царскі горад Элама), «узгорак ападаны» на Пн [руіны ахеменідскага палаца (521 — 1-я пал. 4 ст. да н.э.) з рэльефамі з паліванай цэглы, рэшткі парадной залы-ападаны і храма агню], «узгорак царскага горада» на У (рэзідэнцыя ахеменідскай і сасанідскай знаці), «узгорак горада рамеснікаў» (некропаль парфянскага і селеўкідскага часу) на У ад царскага горада. Ад протаэламскага перыяду (канец 4-га — пач. 3-га тыс. да н.э.) дайшлі багатыя пахаванні з ляпнымі размаляванымі керамічнымі пасудзінамі і помнікамі іерагліфічнай эламскай пісьменнасці; ад эламскага мастацтва (2—1-га тыс. да н.э.) — скульптура, кераміка, размаляваныя паліваныя абліцоўкі, рэльефы, помнікі, прывезеныя з паходаў у Месапатамію (стэлы Нарам-Суэна, ці Нарамсіна, Хамурапі; абедзве ў Луўры). Найб. познія знаходкі адносяцца да 9—10 ст. н.э.

СУЗЫНО́ВІЧЫ Пётр і Адам, бел. дойліды 1-й пал. 17 ст. Жылі ў в. Дайліды Іўеўскага р-на Гродзенскай вобл. Удзельнічалі ў буд-ве Іўеўскай сядзібы і інш. пабудоў Іўеўшчыны.

СУЙ, дынастыя ў Кітаі ў 581—618 Засн. палкаводцам Ян Цзянем, які ў 581 скінуў імператара з дынастыі Паўн. Вэй (што скончыла панаванне на Пн Кітая некітайскіх дынастый) і абвясціў сябе імператарам Вэньдзі [581—604]. У 589 ён аб'яднаў пад сваёй уладай Паўн. і Паўд. Кітай, чым паклаў канец перыяду *паўднёвых і паўночных дынастый*. Ажыццявіў рэформы з мэтай стварэння моцнай цэнтралізаванай дзяржавы. Пры яго пераемніку імператару Ян Гуану [Яндзі; 605—617], кіраванне якога вылучалася крайнім дэспатызмам, пабудавана асн. ч. *Вялікага канала*. Знешнія войны (у Карэі, В'етнаме і інш.) пагоршылі эканам. становішча краіны, а высокія падаткі выклікалі нар. паўстанне (611—618). Ян Гуан забіты сваімі салдатамі, а ўладу ў 618 захапіў намеснік у Таюані — Лі Юань, які заснаваў дынастыю *Тан*.



Сузы. Рэльеф ахеменідскага палаца.

СУ́ЙТА, горад у Японіі, прамысл. спадарожнік г. Осака. Каля 400 тыс. ж. (2001). Чыг. вузел, буйная сартавальная станцыя. Прам-сць: металургічная (вытв-сць электрасталі, пракату), маш.-буд., тэкст., харчовая; піваварны з-д. Месца правядзення сусв. экалагічнай выстаўкі «ЭКСПА-70», мемар. парк у гонар выстаўкі. Нац. этнаграф. музей. Паблізу нац. парк Сэнры.



Сукаватка.

СУК Вячаслаў Іванавіч (16.11.1861, г. Кладна, Чэхія — 12.1.1933), рускі дырыжор, кампазітар. Па паходжанні чэх. Нар. арт. Рэспублікі (1925). Скончыў Пражскую кансерваторыю (1879, кл. А.*Беневіца*). З 1880 у Расіі, дырыжыраваў спектаклямі прыватных оперных труп, з 1886 сімф. дырыжор. У 1906—33 дырыжор Вял. т-ра ў Маскве, адначасова з 1927 і Опернага т-ра імя К.Станіслаўскага. Аўтар муз. твораў у розных жанрах, у т.л. оперы «Лясны цар» (паст. 1900). Яго выканальніцкая дзейнасць паўплывала на станаўленне сав. муз. культуры. У 1890—91 ім паст. опера «Рыгалета» Дж.Вердзі ў Мінску.

Літ.: Руденко В.И. В.И. Сук. М., 1984.

СУК (Suk) Іосеф (4.1.1874, Кршэчавіцы, Чэхія — 29.5.1935), чэшскі скрыпач, кампазітар, педагог. Вучыўся ў Пражскай кансерваторыі (1885—92, з 1922 праф., у 1924—26 і з 1933 яе дырэктар). Вучань А.*Беневіца*, К.Штэкера, А.*Дворжака*. У 1891—1933 удзельнік «Чэшскага квартэта». Канцэртаваў і як саліст-віртуоз. У кампазітарскай творчасці развіваў традыцыі Б.Сметаны, Дворжака. Сярод твораў: 2 сімфоніі (1897, 1906), сімф. паэма «Прага» (1904); фантазія для скрыпкі з арк. (1903), фп. п'есы.

СУКАВА́ТКА, бел. старажытная цяглавая прылада для апрацоўкі глебы; найб. архаічны тып *бараны*; тое, што *вершаліна*.

СУКАВА́ТЫХ Леанід Сямёнавіч (8.12.1930, г.п. Колпны Арлоўскай вобл., Расія — 12.10.1976), бел. вучоны ў галіне анкалогіі, радыялогіі, хірургіі. Д-р мед. н., праф. (1972). Скончыў Ленінградскую ваенна-мед. акадэмію (1955). З 1962 у Бел. НДІ анкалогіі і мед. радыялогіі (кіраўнік аддзялення). Навук. працы па радыеізатопных і хірург. метадах лячэння, пытаннях інтэнсіўнай тэрапіі ў анкалогіі.

Тв.: Радиоизотопная ренография. Мн., 1969 (разам з Л.І.Нісенбаумам, К.І.Гарэльчыкам); Операционный риск и интенсивная терапия в онкологической клинике. Мн., 1976 (у сааўт.).

СУКАВА́ТЫХ Таццяна Мікалаеўна (н. 18.2.1932, г. Курск, Расія), бел. вучоны ў галіне педыятрыі, алергалогіі. Д-р мед.-н. (1977), праф. (1978). Скончыла Курскі мед. ін-т (1955). У 1963—98 у Бел. мед. акадэміі паслядыпломнай адукацыі (у 1974—96 заг. кафедры). Навук. працы па бранхіяльнай астме, алергалогіі.

Тв.: Аллергические болезни // Справочник семейного врача: Педиатрия. Мн., 1997; Бронхиальная астма у детей: новые подходы к диагностике // Медицина. 1997. №3 (18).

СУКА́ЛА, у беларусаў прылада для намотвання (насуквання) нітак з клубка ці з матавіла на *цэўкі*. Уяўляе сабой 2 стойкі з умацаваным паміж імі адшліфаваным валікам з махавым колам, размешчаным бліжэй да аднаго канца валіка. З процілеглага канца ў валік устаўляўся металічны стрыжань, на які надзявалася цэўка. З бакоў і знізу стойкі

змацоўваліся дошкамі ў выглядзе скрынкі для цэвак.

СУКА́ЛА Аляксандр Васілевіч (н. 25.2.1951, г. Рагачоў Гомельскай вобл.), бел. вучоны ў галіне педыятрыі. Д-р мед. н., праф. (1996). Скончыў Мінскі мед. ін-т (1975) і працуе ў ім (у 1988—96 дэкан, з 1994 заг. кафедры, з 1998 прарэктар). Навук. працы па дзіцячай нефралогіі, экапаталогіі, імунных парушэннях у дзяцей.

Тв.: Болезни почек и мочевыводящих путей (разам з І.Н.Усавым) // Справочник семейного врача: Педиатрия. Мн., 1997; Болезни почек и мочевыводящих путей (разам з А.М.Чычко) // Справочник по лечению детских болезней. Мн., 1998.

СУКАЛІ́НСКІ Уладзімір Мікалаевіч (н. 30.9.1951, г. Гомель), бел. вучоны ў галіне анкалогіі і радыебіялогіі. Д-р мед. н. (1990), праф. (1992). Скончыў Мінскі мед. ін-т (1974). З 1985 у Бел. НДІ анкалогіі і мед. радыялогіі (з 1990 заг. аддзела). Навук. працы па распрацоўцы прэпаратаў антыаксідантнага дзеяння і новых спосабаў лячэння злаякасных пухлін, распрацоўцы мадыфікатараў біял. рэакцый у нармальных і злаякасных клетках. Дзярж. прэмія Беларусі 1998.

Тв.: Результаты химиолучевого лечения местнораспространенного (неоперабельного) рака поджелудочной железы (разам з А.А.Лабінскім) // Мед. радиология и радиацион. безопасность. 1998, Т. 43, №1; Новые возможности в лечении рака. Адаптогенные, модифицирующие и противоопухолевые свойства антиоксидантного комплекса АК (разам з А.І.Шмакам, А.А.Лабінскім) // Материалы юбилейной конф., посвящ. 40-летию НИИ онкологии и мед. радиологии РБ. Мн., 2000.

СУКА́РНА (Sukarno; 6.6.1901, г. Сурабая, Інданезія — 21.6.1970), палітычны і дзярж. дзеяч Інданезіі. Скончыў Тэхналагічны ін-т у г. Бандунг (1925). Удзельнік стварэння «Бандунгскага даследчага клуба» (1926), на базе якога ў 1927 створана Нац. партыя Інданезіі; яе першы старшыня. За антыкалан. дзейнасць у 1929—31 у турме, з 1933—42 у ссылцы. У 1945 сфармуляваў 5 прынцыпаў (нацыяналізм, інтэрнацыяналізм, народаўладдзе, сац. справядлівасць, вера ў адзінага Бога), якія сталі афіц. ідэалогіяй Інданезіі. 17.8.1945 С. абвясціў незалежнасць Рэспублікі Інданезія. Абраны яе прэзідэнтам, С. узначаліў барацьбу супраць нідэрл. каланізатараў (1945—49). У 1957—59 па яго ініцыятыве ў краіне сфарміраваны лад т.зв. «накіроўнай дэмакратыі» на аснове канцэпцыі функцыянальных груп, члены якіх звязаны агульнай дзейнасцю, рэлігіяй, адукацыяй і г.д. Быў распушчаны парламент, новыя дэпутаты прызначаны асабіста С., які сканцэнтраваў у сваіх руках заканад. і выканаўчую ўладу. У 1963 абвешчаны пажыццёвым прэзідэнтам краіны. С. адзін з ініцыятараў *Бандунгскай канферэнцыі 1955* і *Недалучэння руху*. Яго накірунак на пашырэнне сувязей з СССР і КНР абвастрыў адносіны з краінамі Захаду, найперш з-за канфлікту з Малайзіяй і выхаду Інданезіі з ААН (студз. 1965). Палітыка С. прывяла да эканам. крызісу, які супаў з вострым канфліктам паміж камуністамі і арміяй. Пасля путчу 30.9.1965 адхілены ад рэальнага кіраўніцтва краінай, у 1967 адмовіўся ад усіх дзярж. пасад.



Сукарна.

Тв.: Рус. пер. — Индонезия обвиняет: Сб. ст. и речей. 3 изд. М., 1961.

Літ.: Юрьев А.Ю. Сукарно // Политические портреты борцов за национальную независимость. 2 изд. М., 1983. *В.У.Адзярыха.*

СУКА́ЧОЎ Даніла Кірэевіч (27.3.1901, в. Семукачы Магілёўскага р-на — 15.5.1973), адзін з арганізатараў і кіраўнікоў антыфаш. падполля і партыз. руху на тэр. Беластоцкай вобл. ў Вял. Айч. вайну. Скончыў Вышэйшую камуніст. с.-г. школу імя Леніна (1935, Мінск). Удзельнік грамадз. вайны 1918—20. З 1924 на гасп. і сав. рабоце. У Вял. Айч. вайну з 1941 у Чырв. Арміі, з 1943 у тыле ворага, чл. Беластоцкага падп. абкома КП(б)Б, старшыня к-та *Беластоцкай абласной антыфашысцкай арганізацыі*. У 1947—57 старшыня Гродзенскага райвыканкома.

СУКАЧО́Ў Уладзімір Мікалаевіч (7.6.1880, с. Аляксандраўка Харкаўскай вобл., Украіна — 9.2.1967), расійскі батанік, лесавод і географ. Акад. АН СССР (1943, чл.-кар. 1920). Герой Сац. Працы (1965). Скончыў Пецярбургскі лясны ін-т (1902). У 1919—41 праф. гэтага ін-та, у 1925—41 Ленінградскага і ў 1948—51 Маскоўскага ун-таў. Адначасова дырэктар Ін-та лесу АН СССР (1944—59), з 1962 у Бат. ін-це АН СССР. Навук. працы па фітацэналогіі, лесазнаўстве, балотазнаўстве, геаграфіі, сістэматыцы і селекцыі раслін. Адзін са стваральнікаў біягеацэналогіі. Распрацаваў тэорыю і методыку лясной тыпалогіі. Заснавальнік і прэзідэнт Усесаюзнага бат. т-ва (1946).

Тв.: Избр. труды. Т. 1—3. Л., 1972—75.



Сукала.

СУКВЕ́ЦЦЕ, парастак (сістэма парасткаў), на якім знаходзяцца кветкі. Уласцівы большасці кветкавых раслін. Па ступені разгалінавання адрозніваюць С. простыя і складаныя. У залежнасці ад тыпу *галінавання* і парадку распускання кветак простыя С. падзяляюць на батрычныя (бакакветныя), або рацэмозныя (монападыяльнае галінаванне, распусканне кветак ад асновы да верхавінкі — *галоўка, гронка, катах, каташок, колас, парасонік, шчыток*), і цымозныя, верхакветныя (сімпадыяльнае галінаванне, распусканне кветак ад верхавінкі да асновы — просты плеяхазій, дыхазій і манахазій). Складаныя С. бываюць аднародныя (напр., складаная гронка, складаны колас), разнародныя (спалучэнне розных тыпаў С. у межах адной групы — батрычнай або цымознай — напр., мяцёлка з каласкоў, дыхазій з манахазіяў) і змяшаныя (камбінацыя батрычных і цымозных С., напр., плеяхазій з кошыкаў, парасонік з манахазіяў). Колькасць кветак у С. ад 1—3 (напр., у гароху) да некалькіх дзесяткаў тысяч (у некат. відаў агавы), даўж. — да 12 м (напр., у пальмаў роду каламус). Будова С. мае значэнне ў сістэматыцы раслін: яна адлюстроўвае кірункі эвалюцыі блізкіх у сістэм. адносінах груп.

СУКЕНІ́ЦКІ (Sukiennicki) Віктар (25.7.1901, каля г. Каўнас, Літва — крас. 1983), польскі гісторык. Д-р права (1927). Вучыўся ў Віленскім і Парыжскім ін-тах. Дацэнт НДІ Усх. Еўропы пры Віленскім ун-це. З 1934 на навук. стажыроўцы ў СССР. У 1941 арыштаваны органамі НКУС і сасланы ў Краснаярск. У 1942 вызвалены, працаваў у польскім пасольстве ў СССР. З 1943 у Вялікабрытаніі, выкладаў у польскім ун-це ў г. Оксфард. З 1952 рэдактар на радыёстанцыі «Свабодная Еўропа». З 1959 у ЗША, працаваў у Гуверaўскім ун-це пры Станфардскім ун-це. Аўтар прац: «Эвалюцыя ладу Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік...» (т. 1—3, 1938—39), «Сучасныя ідэі і палітычныя і грамадскія рухі» (ч. 1—2, Лондан, 1951—54), «Прычыны і пачатак польска-савецкай вайны, 1919—1921» (Лондан, 1963), «Усходне-Цэнтральная Еўропа ў час 1-й сусветнай вайны» (т. 1—2, ЗША, 1984) і інш.

СУКМА́НАЎ Вадзім Мікалаевіч (17.11.1938, с. Ваздзвіжанка Усурыйскага р-на Прыморскага краю, Расія — 28.9.1995), бел. кінарэжысёр. Скончыў Усесаюзны дзярж. ін-т кінематаграфіі (1961). З 1961 на Мінскай студыі навук.-папулярных і хранік.-дакумент. фільмаў, з 1968 на кінастудыі «Беларусьфільм». Творчасць адметная арган. спалучэннем публіцыстычнай завостра-

насці і вобразнай выразнасці, разнастайнасцю тэматыкі. Сярод работ: «Дачка партыі» (1961, пра В.Харужую), «Праз дзесяць гадоў, або Надзеі і трывогі 10 «А» (1973, з Р.Ясінскім; прэмія Ленінскага камсамола Беларусі; спец. прыз Міжнар. кінафестывалю ў Ньёне, Швейцарыя; усе 1974), «Вялікая дыягналь» [1976, прызы міжнар. кінафестываляў спарт. фільмаў, Блетчлэй (Англія), Будапешт, абодва 1977], «Дзядзька Якуб» (1981), «Астравы капітана Маўра» (1983), «Вяртанне ў першы снег» (1985) «Леў Сапега, канцлер» (з Ясінскім), «Пад знакам Пагоні» (абодва 1992), «Вечны выгнаннік» (1993), «Віленскі зборнік» (1994) і інш.

СУКНАРО́БСТВА, хатняе рамяство па вырабе сукна, тканіны з ваўняных нітак у многіх народаў. На Беларусі з самаробнага сукна шылі верхняе мужчынскае і жан. адзенне (світы, сярмягі, бараўкі і інш.), штаны-суконнікі, спадніцы-андаракі, рабілі цёплыя анучы-суконкі, шыты абутак — буркі і інш. Сыравінай была воўна. Найб. якаснае сукно было з воўны старых авечак, стрыжаных увосень. Воўну сартавалі, мылі, сушылі, скублі, часалі на грабянях ці ваўначосках, пралі. На кроснах ткалі сукно і паўсукно пераважна ў 4 ніты. Колер залежаў ад колеру воўны (белы, шэры, чорны). Нярэдка белае сукно фарбавалі. Белы колер паводле традыцыі пераважаў на Магілёўшчыне, ва ўсх. паветах Віцебскай і паўд. паветах Мінскай губ.; шэры найб. пашыраны на Пн3 Беларусі. Фарбавалі сукно расл., а з пач. 20 ст. — хім. фарбавальнікамі. Напр., на Пд3 для фарбавання тканін у карычневы колер сяляне ўжывалі торф. Каб атрымаць чорны колер, у Мінскай губ. сукно клалі ў настой іржавага жалеза. Сукно абавязкова валялі, валілі, білі, мялі босымі нагамі або ў ручных валюшнях. З 2-й пал. 19 ст. пашыраны мех. спосаб валення на валюшнях (фалюшах) з дапамогай вадзянога кола або з паравым прыводам. З сярэдзіны 20 ст. саматужнае С. на Беларусі не існуе, бытуе як маст. промысел па вырабе дываноў, дарожак, посцілак і інш.

Н.І.Буракоўская.



Суквецці. Простыя: 1 — гронка (ландыш); 2 — шчыток (груша); 3 — колас (чараўнік); 4 — парасонік (першацвет); 5 — катах (капытнік); 6 — галоўка (канюшына); 7 — кошык (нівянік). Складаныя: 8 — падвойная гронка (крынічнік); 9 — падвойны складаны парасонік (морква); мяцёлкі: 10 — пірамідападобная (бэз), 11 — шчыткападобная (рабіна); 12 — шчыт (залозніца); 13 — дыхазій (зоркаўка); 14 — манахазіі: 14а — звіліна (незабудка), 14б — завіток (святаяннік).

СУКНО́, ворсавая ці бязворсавая шарсцяная, паўшарсцяная або баваўняная тканіна. Пры вырабе апрацоўваецца *валяннем*, што прыводзіць да ўтварэння на добрым баку С. лямцападобнага слоя (т.зв. засцілу), які закрывае рысунак перапляцення нітак. Выкарыстоўваюць для пашыву паліто, касцюмаў, форменнага адзення, а таксама ў тэхніцы для вырабу фільтраў, пракладак і інш.

СУКО́ЎСКІ Эраст, бел. мастак 2-й пал. 19 — пач. 20 ст. Жыў у Мінску. Верагодна, вучыўся ў Пецярбургскай АМ. Працаваў пераважна ў акварэлі, пісаў жанравыя кампазіцыі, пейзажы. Стаяў на пазіцыях крытычнага рэалізму, што найб. выявілася ў творах «Сям'я цесляроў», «Апраўданая», «Асуджаны», «З прашэннем», «Бедны, але высакародны чалавек», «Жабракі». Аўтар пейзажаў «Дарога ў палескіх балотах у завіруху», «Зімовая дарога па рацэ на Палессі», «Раніцай на пароме», «Сядзіба ў Пінскіх балотах», «Па дарозе на возера Свіцязь», «Мора ў Остэндзе», жанравых кампазіцый «Паляўнічая тройка», «Паляўнічыя з хартамі», «Паездка цугам», «Местачковы аркестр» (1911) і інш.

СУ́КРЭ (Sucre) Антоніо Хасэ (3.2.1795, г. Кумана, Венесуэла — 4.6.1830), адзін з кіраўнікоў вайны за незалежнасць ісп. калоній у Амерыцы 1810—26. Маршал (1824). У 1810 далучыўся да арміі Ф.*Міранды*. Бліжэйшы паплечнік С.*Балівара*. Узначаліў паход паўстанцкай арміі ў Эквадор і Перу; пад яго кіраўніцтвам армія перамагла іспанцаў у бітвах пры Пічынчы (1822) і Аякуча (1824). Садзейнічаў стварэнню ў 1825 на тэр. Верхняга Перу рэспублікі Балівія, у 1826—28 яе часовы прэзідэнт. У выніку антыўрадавага мяцяжу ў 1828 пакінуў Балівію. Узначаліў войскі Вял. Калумбіі, якія перамаглі 1829 перуанцаў у бітве пры Хуніне. У пач. 1830 абраны прэзідэнтам Нац. кангрэса Вял. Калумбіі. Забіты паліт. праціўнікамі. Імем С. названы горад у Балівіі, штат у Венесуэле, грашовая адзінка ў Эквадоры.

СУКТО́РЫІ, клас прасцейшых жывёл, гл. *Сысучыя інфузорыі*.

СУКУЛЕ́НТЫ (ад лац. succulentus сакавіты), шматгадовыя расліны з сакавітым, мясістым лісцем (агавы, алоэ) або сцёбламі (кактусавыя, некат. малачаі); тып *ксерафітаў*. Пашыраны ў пустынях Цэнтр., Паўн., Паўд. Амерыкі і Паўд. Афрыкі. Пераносяць высокія т-ры паветра, але не вытрымліваюць абязводжвання. На Беларусі С. пераважна з сям. таўсцянкавых (напр., *расходнік, скочкі*). У працэсе эвалюцыі ў С. выпрацавалася здольнасць назапашваць ваду ў лісці або сцёблах з моцна развітой ваданоснай парэнхімаю. Некат. кактусы канцэнтруюць у сцёблах 1—3 т вады, а

спец. прыстасаванні (тоўсты кутынізаваны эпідэрміс, валаскі, невял. колькасць вусцейкаў і інш.) дазваляюць эканомна расходаваць яе. Святлолюбівыя расліны.

СУКУ́ПНАСЦЬ ГЕНЕРА́ЛЬНАЯ, сукупнасць сац. аб'ектаў, якія належаць вывучэнню ў межах, азначаных праграмай *сацыялагічных даследаванняў*. Гэта аб'екты, якія маюць прасторава-часавыя межы або прадстаўляюць яўную ці гіпатэтычную мадэль пры інш. відах несуцэльнага назірання. Прасторавыя межы могуць быць геагр. (тэрытарыяльныя), напр., вобласць, раён, прадпрыемства, або вызначацца як занятае насельніцтва, дарослае насельніцтва ад 18 гадоў, вучні школ, работнікі прамысл. прадпрыемства і інш. Часавыя межы — перыяд і тэрмін, калі праводзяцца даследаванні (сезон, цыкл вытв-сці). Звычайна на практыцы даследуецца толькі частка С.г. (выбарачная сукупнасць), якая павінна з неабходнай дакладнасцю адпавядаць усёй С.г. *І.В.Катляроў.*

СУКУ́ПНЫ ГРАМА́ДСКІ ПРАДУ́КТ, сума матэрыяльных даброт, створаных ва ўсіх галінах матэрыяльнай вытв-сці за пэўны прамежак часу (звычайна за год). Тэарэт. аснову С.г.п. складае марксісцкая тэорыя аб прадукцыйнай і *непрадукцыйнай працы*, адпаведна якой прадукт ствараецца толькі працай у *сферы матэрыяльнай вытворчасці*. Паводле формы і прызначэння С.г.п. падзяляецца на *сродкі вытворчасці* і *прадметы спажывання*, па вартасці — на вартасць зрасходаваных сродкаў вытв-сці, вартасць неабходнага прадукту, вартасць прыбавачнага прадукту. Паводле гэтай канцэпцыі вартасць зрасходаваных сродкаў вытв-сці прызначаецца для пакрыцця зношаных (ужытых) сродкаў вытв-сці (фонд амартызацыі) і аднаўлення *абаротных сродкаў* (фонд матэрыяльных затрат); вартасць неабходнага прадукту — для ўзнаўлення рабочай сілы (заработная плата, грамадскія фонды спажывання работнікаў матэрыяльнай вытв-сці), вартасць прыбавачнага прадукту — для стварэння грамадскіх фондаў спажывання астатніх пластоў насельніцтва (невытв. сац. сферы) і на расшырэнне вытв-сці (накапленне). Такім чынам, у працэсе спажывання С.г.п. падзяляецца на фонды пакрыцця, спажывання і накаплення. У цэлым гэты паказчык адлюстроўваў агульны малюнак развіцця матэрыяльнай вытв-сці. Але шэраг недахопаў у методыцы яго разлікаў (паўторнае лічэнне, неўключэнне ў сукупны прадукт паслуг невытв. сферы і інш.) скажалі эканам. паказчыкі, ускладнялі іх параўнанне з паказчыкамі інш. краін. На Беларусі з пач. 1990-х г. пры аналізе вынікаў развіцця эканомікі ўжываюцца прынятыя ў міжнар. практыцы паказчыкі *валавога ўнутранага прадукту* і *валавога нацыянальнага прадукту*, якія разлічваюцца па сукупнай вартасці канчатковай прадукцыі. *М.І.Платніцкі.*

СУКУ́ПНЫ РАБО́ЧЫ, сукупны работнік, паняцце, якое характарызуе якасць і ўзровень развіцця *рабочай сілы*; сукупнасць працаўнікоў, грамадская камбінацыя індывід. рабочых сіл, якія непасрэдна ці апасродкавана ўдзельнічаюць у вытв. працэсе, ствараючы пэўныя спажывецкія вартасці. У С.р. адрозніваюць 2 бакі: па змесце ён — элемент прадукц. сіл грамадства, які гістарычна абумоўлены пэўным характарам працэсу працы (рамесным, машынным і інш.), узроўнем падзелу працы, характарам і памерам выкарыстаных сродкаў вытв-сці; па форме ўключае ў сябе сістэму вытв. адносін, у якія ўступаюць члены С.р. з уласнікам сродкаў вытв-сці. Дае магчымасць рацыянальна размяркоўваць работнікаў па вытв. і дапаможных функцыях у залежнасці ад іх здольнасцей, эканомна выкарыстоўваць іх працу.

СУ́КУР, горад у цэнтр. частцы Пакістана, на р. Інд, у правінцыі Сінд. Каля 250 тыс. ж. (2001). Вузел чыгунак і аўтадарог. Аэрапорт. Прам-сць: маш.-буд., металаапрацоўчая, тэкст., харчовая; прадпрыемствы па перапрацоўцы с.-г. прадукцыі (бавоўнаачышчальныя, мукамольныя і інш.). ЦЭС. Саматужныя промыслы і рамёствы: ручное дывануткацтва, разьба па дрэве, вышыванне, вытв-сць маст. вырабаў з тэкстылю, скуры, металаў, вырабнога каменю (оніксу). Каля С. — асн. плацінна разгалінаванай ірыгацыйнай сістэмы.

СУКЦЫНА́Т, універсальны *метабаліт*, аніён *бурштынавай кіслаты*. Утвараецца пры акісленні і ўзаемаператварэнні вугляводаў, бялкоў, тлушчаў у клетцы.

Ёсць у тканках жывёл, раслін, мікраарганізмах; таксама ў бурштыне, смолах, бурым вугалі. У жывёльных арганізмах сінтэзуецца з сукцыніл-кафермента А, у нерв. тканцы — з бурштынавага паўальдэгіду. У раслінах і мікраарганізмах утвараецца пры расшчапленні ізалімоннай к-ты, пры сукцынат-прапіянатным браджэнні, узнаўленні фумаравай к-ты, метабалізме аргініну і путрэсціну. Удзельнічае ў сінтэзе глюкозы, тлустых к-т, парфірынаў; валодае адаптагеннай актыўнасцю, паляпшае мікрацыркуляцыю, нармалізуе энергет. і пластычны абмен, аказвае антысклератычнае ўздзеянне і інш. Белыя бясколерныя крышталі, малекулярная маса 118,09, $t_{пл}$ — 185 °С, раствараецца ў вадзе, спірце, эфіры, ацэтоне; не раствараецца ў бензоле, хлараформе, чатыроххлорыстым вугляродзе. С. і яго вытворныя выкарыстоўваюцца ў медыцыне, таксама ў вытв-сці інсектыцыдаў, пластмас, поліэфірных смол, фарбавальнікаў. *І.М.Семяненя.*

СУКЦЫНАТДЭГІДРАГЕНА́ЗА, фермент класа *аксідарэдуктаз*, які каталізуе зваротную рэакцыю акіслення *бурштынавай кіслаты* ў фумаравую; удзельнічае ў *трыкарбонавых кіслот цыкле*.

Пашырана ў жывёльным і расл. свеце. У чалавека і вышэйшых пазваночных жывёл найб. С. у нырках, печані, сэрцы. Лакалізавана ва ўнутр. мембране мітахондрый, малекулярная маса каля 100 тыс. У актыўным цэнтры С. ўтрымліваецца флавінадэнінднынуклеатыд, 2 жалеза-серныя (Fe_2S_2) цэнтры (пры акісленні *сукцынату* атамы жалеза С. мяняюць валентнасць і *сульфгідрыльныя групы*, неабходныя для актыўнасці ферменту). Оптымум дзеяння С. пры pH 7—8. Адзін з найб. моцных інгібітараў С. — *малонавая кіслата*, а таксама рэчывы, што звязваюць сульфгідрыльныя групы. Адыгрывае вял. ролю ў транспарце іонаў натрыю праз мембраны эпітэліяльных клетак канальцаў нырак і рэгуляцыі асматычнага ціску ў арганізме. *І.М.Семяненя.*

СУКЦЭ́СІЯ (ад лац. successio пераемнасць, наследаванне), паслядоўная змена *біяцэнозаў* на пэўным участку зямной паверхні. Класічную тэорыю С. распрацаваў амер. батанік Ф.Клеменс (1916). С. адбываецца на фоне ўскладнення стратэгіі відаў, структуры папуляцый, трафічных ланцугоў і інш. і вядзе да ўстойлівага стану — *клімаксу*. Біяцэнозы, што змяняюць адзін аднаго, утвараюць сукцэсійны рад або серыю. Асн. механізм С. — аднаўленне *раўнавагі экалагічнай* паміж біятычнымі згрупаваннямі і фактарамі знешняга асяроддзя.

Пры першасных С. згрупаванні раслін і жывёл узнікаюць на месцах, пазбаўленых жыцця (пясчаных дзюнах, горных пародах, лавах, маладых алювіях). Пры другасных С. адбываецца самаўзнаўленне парушаных згрупаванняў (напр., пасля пажараў, паводак, засух). Вылучаюць С. прыродна абумоўленыя (энда- і экзагенныя) і антрапагенныя. Эндагенныя С. адбываюцца ў выніку ўнутр. працэсаў развіцця біягеацэнозаў (напр., пры зарастанні вадаёмаў), экзагенныя С. выкліканы ўздзеяннем знешніх экалагічных фактараў (напр., эрозіяй глеб, кліматычнымі ўздзеяннямі). Экзагенныя С., што абумоўлены агульнымі геал. зменамі, наз. голагенетычнымі. Антрапагенныя С. развіваюцца пад уздзеяннем гасп. дзейнасці (высечкі лесу, разворванне зямель, выпас жывёл, выкіды і сцёкі прамысл. прадпрыемстваў).

СУ́ЛА (Sula), група астравоў у Малайскім архіпелагу, на У ад в-ва Сулавесі, тэр. Інданезіі. Пл. 4,8 тыс. км². Асн. а-вы: Таліабу, Манголе, Санана. Горы (выш. да 1157 м на в-ве Таліабу) і ўзгорыстыя раўніны. Складзены пераважна са сланцаў і гранітаў, якія перакрыты пясчанікамі і вапнякамі. Клімат экватарыяльны, ападкаў 1700—3000 мм за год. Вільготныя вечназялёныя трапічныя лясы. Трапічнае земляробства: вырошчванне какосавай пальмы, рысу, кукурузы. Рыбалоўства. Порт Санана (на в-ве Санана).

СУЛА́, рака ў Стаўбцоўскім р-не Мінскай вобл., правы прыток р. Нёман. Даўж. 76 км. Пл. вадазбору 520 км². Пачынаецца за 700 м на Пд ад в. Таўкачоўшчына. Цячэ па паўд.-зах. схілах Мінскага ўзв., у ніжнім цячэнні перасякае невял., зрэдку забалочаныя лясныя масівы. Упадае ў р. Нёман за 700 м на Пн ад в. Беражна Карэліцкага р-на Гродзенскай вобл. Даліна слабазвілістая, трапецападобная, шыр. 300—500 м, месцамі пашыраецца да 2 км. Пойма двухбаковая, шыр. 200—300 м, зрэдку пашыраецца да 600 м, перасечана лагчынамі і старыцамі. Рэчышча моцназвілістае, шыр. ракі ў межань ад 3 м у верхнім да 20 м у ніжнім цячэнні. У суто-

ках рэк С. і Нёман зона адпачынку Аталезь.

СУ́ЛА Луцый Карнелій (Lucius Cornelius Sulla; 138—78 да н.э.), старажытнарымскі ваен. і паліт. дзеяч. Вызначыўся ў *Югурцінскай вайне* (111—105 да н.э.), узяў у палон цара Нумідыі Югурту. У 104—102 да н.э. ўдзельнічаў у вайне з тэўтонамі і кімврамі. У 93 да н.э. прэтар, у 92 да н.э. прапрэтар Кілікіі. Легат і ваен. трыбун у *Саюзніцкай вайне 90—88 да н.э.*, консул і галоўнакамандуючы ў вайне супраць *Мітрыдата VI Еўпатара*. Адхілены ад гэтай пасады на карысць *Марыя*, рушыў свае войскі на Рым, авалодаў ім і аднавіў уладу *аптыматаў*. Пераправіўшыся ў Грэцыю, захапіў



Выява Луцыя Карнелія **Сулы** на дэнарыі. 63—62 да н.э.

Афіны, разбіў пантыйскія войскі і заключыў мір з Мітрыдатам VI Еўпатарам, абклаў кантрыбуцыяй правінцыю Азія. У 83 да н.э. высадзіўся ў Італіі, разбіў войскі *папулярыў* (марыянцаў) і абвясціў сябе дыктатарам. Яго дыктатура суправаджалася тэрорам: ахвярамі сталі каля 4,7 тыс. рым. грамадзян, вынішчаны цэлыя плямёны (самніты, этрускі). С. абапіраўся на ветэранаў, якіх адорваў зямельнымі надзеламі, дзярж. пасадамі, у т.л. месцамі ў сенаце. Дыктатура С. была скіравана на ўмацаванне ўлады сенацкай алігархіі. У 79 да н.э. С. склаў паўнамоцтвы дыктатара. Аўтар «Мемуараў» (не захаваліся).

Літ.: Утченко С.Л. Древний Рим: События. Люди. Идеи. М., 1969; Плутарх. Избранные жизнеописания. Мн., 1998; Инар Ф. Сулла: Пер. с фр. Ростов н/Д, 1997. *А.Г.Зельскі.*

СУЛАВЕ́СІ (Sulawesi), Целебес, востраў у Малайскім архіпелагу, самы ўсходні з *Вялікіх Зондскіх астравоў*, тэр. Інданезіі. Пл. каля 170 тыс. км². Нас. каля 15 млн. чал. (2000). Складаецца з 4 доўгіх паўастравоў. Берагавая лінія вельмі парэзана, але зручных гаваней мала. Паверхня гарыстая (выш. да 3455 м, г. Рантэкомбала). Шмат патухлых вулканаў, на ПнУ ёсць дзеючыя (Клабат і Сапутан). Частыя землетрасенні. С. складзены са стараж. гранітаў і гнейсаў, мезазойскіх вапнякоў, маладых асадкавых і вулканічных парод. Карысныя выкапні: жалеза, нікель, золата, серабро, свінец, волава, вугаль, нафта. Клімат субэкватарыяльны, мусонны, на Пн — экватарыяльны. Сярэднегадавая т-ра на ўзбярэжжы 25—27 °С, ападкаў 2000—5000 мм за год. Шмат азёр і горных рэк. Вільготныя трапічныя лясы (пальмы, пандануса, сандалавае, эбенавае, цікавае і інш. дрэвы, ліяны, бамбук). На Пд высакатраўныя саванны. У складзе фауны кабан-бабіруса, сумчатыя (кускусы), чубаты макак, райская птушка, какаду і інш. Вырошчваюць какосавыя пальмы, рыс, батат, кукурузу, чорны перац, каву, мускатны арэх. Рыбалоўства. Асн. гарады: Уджунгпанданг (Макасар), Манада, Гарантала.

СУЛЕЙМА́Н І КАНУНІ́ (Süleyman I Kanuni), Сулейман Заканадавец (у еўрап. л-ры — Сулейман Пышны, Вялікі; 27.4.1495 — 6.9.1566), турэцкі султан [1520—66]. Вёў заваёўніцкую палітыку, пры ім *Асманская імперыя* дасягнула найб. магутнасці. Пад яго кіраўніцтвам тур. армія ў 1521 узяла Бялград, разбіла венграў у *Мохацкай бітве 1526*, у выніку якой б.ч. Венгрыі далучана да Асманскай імперыі. У 1530-я г. ім заваяваны Ірак, в-аў Родас, Трыпалітанія, Алжыр, вёў войны з Іранам за авалоданне Закаўказзем. Пры ім складзены збор законаў (кануннаме). Значную частку багацяў траціў на будаўніцтва палацаў, культавых збудаванняў і інш.

СУЛЕЙМА́Н РУСТА́М (сапр. Сулейман Алі-Абас аглы Рустам-задэ, 27.11.1906, Баку — 1989), азербайджанскі паэт, драматург. Засл. дз. маст. Азербайджана (1943). Нар. паэт Азербайджана (1960). Герой Сац. Працы (1976). Вучыўся ў Азерб. (з 1927), Маскоўскім (з 1929) ун-тах. Друкаваўся з 1923. Зб-кі вершаў «Ад смутку да радасці» (1927), «Зорка» (1934), «Чапаеў» (1936), «Рамантыка ночы» (1938), «Два берагі» (1949, Дзярж. прэмія СССР 1950), «Каспійскія хвалі» (1971), «Душа» (1974), «Песні пра Радзіму», «Маё сонца» (абодва 1980). Аўтар п'ес «Гачак Набі» (1940, 2-я рэд. 1948), «Дурна» (1948) і інш.

Тв.: Рус. пер. — Избранное. М., 1976; Железные строки: Стихи. М., 1982.

СУЛЕЙМА́Н СТА́ЛЬСКІ (18.5.1869, аул Ашага-Стал, Дагестан — 23.11.1937), лезгінскі паэт. Нар. паэт Дагестана (1934). У сац.-быт. эпіграмах, песнях, сатыр. вершах пратэст супраць носьбітаў зла і прыгнёту («Суддзі», «Старшына», «Двухногі асёл» і інш.). Аўтар паэмы-хронікі «Дагестан» (1935—36), «Паэмы пра Сярго Арджанікідзе» (1936), паэмы «Думы пра Радзіму» (1938). Сваёй творчасцю ўзняў фальклор да ўзроўню л-ры.

Тв.: Рус. пер. — Стихи и песни. М., 1936; Избранное. М., 1969.

Літ.: Корабельников Г.М. Сулейман Стальский. М., 1979.

СУЛЕЙМА́НАВЫ ГО́РЫ, ускраінныя горы на У Іранскага нагор'я ў Пакістане (паўн. адгор'і ў Афганістане). Дуга С.г. паміж Памірскім і Квета-Пішынскім вузламі скучвання складаецца з сістэмы субмерыдыянальна выцягнутых на 600 км паралельных хрыбтоў пры шыр. каля 300 км, амаль аднавышынных (выш. 1800—2100 м), раздзеленых пласкагор'ямі і скразнымі далінамі. Найб. выш. (3441 м) на масівах Абашта-Цукай і Тахты-Сулейман («Трон Саламона»).

Складзены пераважна з вапнякоў і пясчанікаў, змятых у складкі ў кайназоі. Стромка абрываюцца да даліны р. Інд. Моцна сейсмічныя. Клімат сухі, субтрапічны. Паўн.-ўсх. схілы пад уплывам летняга мусону. Пераважаюць ландшафты сухіх стэпаў і пустынь. На У і ПнУ вышынная занальнасць. Лясная і кустовая расліннасць (дуб, хвоя Жарардзі, ядловец мнагаплодны). У рачных далінах паліўное земляробства, садаводства. *А.Я.Яротаў.*

СУЛЕЙМЕ́НАЎ Алжас Амаравіч (н. 18.5.1936, г. Алматы, Казахстан), казахскі пісьменнік. Скончыў Казахскі ун-т (1959) і Літ. ін-т імя М.Горкага ў Маскве (1961). Друкуецца з 1959. Піша на рус. мове. Аўтар зб-каў вершаў «Аргамакі» (1961), «Сонечныя ночы» (1962), «Ноч-парыжанка» (1963), «Добры час усходу» (1964), «Год малпы» (1967), «Гліняная кніга» (1969), «Кожны дзень — раніца», «Паўтараючы ў поўдзень» (абодва 1973), «Круглая зорка» (1975), «Вызначэнне берага» (1976), зб. вершаў і прозы «Над белымі рэкамі» (1970), кн. нарысаў «Аз і я» (1975), даследаванняў «Мова пісьма» (2000), «Усмешка Бога» (2001). Творчасць вызначаецца складанасцю паэт. асацыяцый, філасафічнасцю, публіцыстычнасцю. Паводле сцэнарыяў С. зняты фільмы «Зямля бацькоў» (1966), «Сіні маршрут» (1968). На бел. мову асобныя яго вершы пераклаў Р.Барадулін.

Літ.: Каратаев М. Дым отечества // Каратаев М. Мировоззрение и мастерство. Алма-Ата, 1965.

СУЛЕМА́ (ад лац. sublimatum літар. — здабыты ўзгонкай), дыхларыд ртуці $HgCl_2$ (гл. *Ртуці хларыды*).

СУ́ЛІК-САРНО́ЎСКІ (Sulik-Sarnowski) Нікадзім (15.8.1893, в. Каменна-Стара Саколкаўскага пав. Гродзенскай губ., цяпер у Падляскім ваяв. Польшчы —

14.1.1954), польскі ваен. дзеяч бел. паходжання. Ген. брыгады (1942). У час вучобы ў Пецярбургскай духоўнай семінарыі ўваходзіў у бел. нац. гурток. У 1-ю сусв. вайну на Валыні і Рум. фронце. З 1918 на камандных пасадах у Войску Польскім. У 1919—20 у 1-й *літоўска-беларускай дывізіі*. Удзельнік абарончай вайны Польшчы супраць фаш. Германіі ў вер. 1939. У 1939—41 у падп. Саюзе ўзбр. барацьбы ў Варшаве, потым у Вільні. У крас. 1941 арыштаваны органамі НКУС, у жн. вызвалены паводле *савецка-польскага пагаднення 1941*. З сак. 1942 у польскай *Андэрса арміі*, з крас. 1942 камандзір 5-й крэсавай дывізіі пяхоты, каля палавіны вайскоўцаў якой складалі беларусы і ўраджэнцы Зах. Беларусі. Удзельнічаў у *Італьянскай кампаніі 1943—45*. Станоўча ставіўся да бел. руху ў польскай арміі. З 1946 жыў у Вялікабрытаніі, дзе і памёр. У вер. 1993 перапахаваны на радзіме.

Тв.: Okruchy wspomnień. Białystok, 1993.

Літ.: Весялкоўскі Ю. Няясна мроіліся новыя дарогі. Лондан, 1997.

Ю.В.Грыбоўскі.

СУЛІМА́ Іван Міхайлавіч (?, с. Рагошчы Чарнігаўскай вобл., Украіна — 12.12.1635), гетман нерэестравых (не залічаных на каралеўскую службу Рэчы Паспалітай) запарожскіх казакоў. З укр. шляхціцаў. Ратуючыся ад прыгнёту польскіх магнатаў, уцёк у *Запарожскую Сеч*. Удзельнік паходаў супраць крымскіх татараў і туркаў. Як гетман вядомы з 1628. У 1635 нерэестравыя казакі на чале з С. паўсталі і разбурылі польскую крэпасць Кадак на Дняпры, якая пагражала Запарожскаму войску. С. неўзабаве па-здрадніцку схоплены рэестравымі казакамі і выдадзены польскім уладам. Пакараны смерцю ў Варшаве.

СУ́ЛІЦА, кароткае *кап'ё*; адзін са стараж. відаў *кідальнай зброі*. Упамінаецца ў «*Слове аб паходзе Ігаравым*» (12 ст.) як зброя рус. і палавецкіх воінаў. Даўжыня каля 1 м. Складалася з жалезнага наканечніка, які падзяляўся на пяро (г.зн. вастрыё) і тулею (трубку), куды ўстаўлялася лёгкае дрэўка—ратовішча. Насілі С. ў *калчане*. Выкарыстоўвалася ў рус. конніцы да канца 17 ст.



Суліца.

СУЛКО́ЎСКІ Уладзімір Якаўлевіч (н. 19.7.1950, г. Брэст), бел. мастак. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1974). У 1974—81 выкладаў у Рэсп. школе-інтэрнаце па музыцы і выяўл. мастацтве. Працуе ў станковым жывапісе ў жанрах тэматычнай карціны, партрэта, пейзажа. Творы адметныя своеасаблівай кампазіцыйнай пабудовай, выкарыстаннем фактурнай манеры пісьма, імкненнем да эпічнасці. Сярод твораў: «Полацкі нацюрморт» і «На родным Палессі» (абодва 1974), «Зямля Браслаўская» (1983), «Мой бераг родны» (1985), «Верасень» і «Партрэт М.Багдановіча» (абодва 1991), «Навальніца на Палессі» (1992), «На прадвесні» (1993); серыя палотнаў «Радзіма Якуба Коласа» (23 карціны; 1986—89).

І.Л.Чэбан.

СУЛТА́Н (араб. — улада, правіцель), тытул вярх. правіцеля ў шэрагу мусульм. краін. У шырокі ўжытак уведзены пасля стварэння *Сельджукскай дзяржавы* ў 11 ст., правіцелі якой прынялі тытул С. Тытул С. насілі правіцелі Асманскай імперыі (да 1922), Егіпта (13—16 ст., 1914—22), Марока (да 1957), многіх дзярж. утварэнняў у Зах. і Усх. Афрыцы, племянныя правадыры ў Паўд. Аравіі; яго мае цяперашні правіцель Амана.

СУЛТА́Н у батаніцы, несапраўдны колас, суквецце многіх злакаў. Падобны на складаны колас, але з'яўляецца разнавіднасцю *мяцелкі* са скучаных каласкоў з вельмі кароткімі галінкамі (напр., *лісахвост, цімафееўка*).

СУЛТА́Н МУХА́МЕД (канец 1470-х г., г. Тэбрыз, Іран — 1555), іранскі мініяцюрыст, кіраўнік тэбрызскай школы мініяцюры. Вучыўся ў Ага Мірэка. Працаваў у шахскай б-цы, займаўся маст. выхаваннем шаха Тахмаспа І. Аформіў рукапісы «Дыван» Хафіза (канец 1520-х г.), «Шахнамэ» Фірдаўсі (1526—27), «Хамсэ» Нізамі (1539—43), мініяцюры якіх вызначаюцца дынамічнасцю і вытанчанай гармоніяй кампазіцыі, дэкаратыўнасцю каларыту, рэаліст. выразнасцю пейзажаў, поз і жэстаў людзей і жывёл. Аўтар шматлікіх партрэтных мініяцюр, эскізаў дываноў з выявамі сцэн паляванння, ювелірных і керамічных вырабаў.

Літ.: Керимов К. Султан Мухаммед и его школа. М., 1970.

СУ́ЛУ (Sulu), міжастраўное мора Ціхага ак. паміж а-вамі Філіпінскімі, Палаван, Калімантан і архіпелагам Сулу. Абмывае берагі дзяржаў Малайзія і Філіпіны. Пл. 335 тыс. км^2. Найб. глыб. 5576 м. Каля паўд. берагоў каралавыя рыфы. Т-ра паверхневых вод зімой каля 25 °С, летам каля 29 °С. Салёнасць 33—34,5‰. Прылівы няправільныя паўсутачныя (2—3 м). Промысел рыбы, пераважна тунца. Гал. парты: Пуэрта-Прынсеса (в-аў Палаван), Ілаіла (в-аў Панай), Замбаанга (в-аў Мінданао) — на Філіпінах, Сандакан (в-аў Калімантан) — у Малайзіі.

СУЛЦІ́-ТУРА́, Тура-тала, у міфалогіі чувашоў вышэйшае бажаство, нябесны Бог-творца. Ён дае дождж на палі, даруе ўраджай і шчасце людзям. Лічылася, што пры ім знаходзіліся інш. багі — стваральнікі душ (Чун суратакан тура), дзяцей (Ывал-хер суратакан тура), хатніх жывёл (Выльах-чэрлех суратакан тура), жылля (Сурт суратакан тура), багаццяў (Мул суратакан тура), і інш.

СУЛЬФ..., СУЛЬФА... (ад лац. sulphur, sulfur *сера*), у хімічных, мед. і інш. тэрмінах састаўная частка слоў, якая абазначае дачыненне да серы, напр., *сульфаты, сульфіды, сульфаніламіды*.

СУЛЬФАКІСЛО́ТЫ, сульфонавыя кіслоты, арганічныя злучэнні, якія маюць аднавалентную сульфагрупу, ці сульфонавую групу (SO_2OH), злучаную з арган. радыкалам. Агульная ф-ла С. — RSO_3H, дзе R — алкіл, арыл або гетэрацыклічны радыкал. Класіфікуюць паводле прыроды арган. радыкала, наяўнасці інш. замяшчальнікаў і колькасці сульфонавых груп у малекуле. Найважн. С. — алкан-, аксі- і амінасульфакіслоты, араматычныя С.

Большасць С. — крышт. гіграскапічныя рэчывы, растваральныя ў вадзе. Моцныя к-ты, утвараюць солі і эфіры (сульфанаты), галагенангідрыды (сульфагалагеніды RSO_2Hal), аміды (сульфаміды RSO_2NH_2). Араматычныя С. пры награванні гідралізуюцца да вуглевадародаў з вылучэннем сернай к-ты. Араматычныя С. атрымліваюць *сульфіраваннем*, аліфатычныя — сульфакісленнем і сульфхлараваннем (сульфіраванне пры сумесным дзеянні дыаксіду серы SO_2 адпаведна з кіслародам ці хлорам у прысутнасці ініцыятараў або пры апрамяненні). Араматычныя С. з'яўляюцца паўпрадуктамі ў вытв-сці фенолаў, нафтолаў, фарбавальнікаў, лек. сродкаў (гл. *Сульфанілавая кіслата*), іонаабменных смол і інш. Тэхн. сумесь метан-, этан- і прапансульфонавых кіслот выкарыстоўваюць як каталізатар арган. рэакцый, растваральнік, солі алкансульфонавых кіслот — як мыйныя сродкі, паверхнева-актыўныя рэчывы, эмульгатары і інш.

Я.Г.Міляшкевіч.

СУЛЬФАНІ́ЛАВАЯ КІСЛАТА́, *п*-амінабензолсульфакіслата, араматычная *сульфакіслата*.

Бясколерныя крышталі, малараствараль ныя ў вадзе. С.к. існуе ў выглядзе біпалярнага іона (унутр. соль), таму не ўтварае солей з мінер. к-тамі, аднак сульфагрупа можа быць нейтралізавана шчолачамі з утварэннем добра растваральных у вадзе солей (напр., натрыевая соль $H_2N—C_6H_4—SO_3Na$). Атрымліваюць *сульфіраваннем* аніліну канцэнтраванай сернай к-той пры 180 °С. Выкарыстоўваюць у вытв-сці *азафарбавальнікаў*, як рэагент у аналіт. хіміі і для вызначэння білірубіну ў крыві, амід С.к. ($H_2N—C_6H_4—SO_2NH_2$ — белы стрэптацыд) і яго вытворныя (*сульфаніламіды*) у медыцыне.



Структурная формула **сульфанілавай кіслаты** (а) і яе біпалярнага іона (б).

СУЛЬФАНІЛАМІ́ДЫ, сінтэтычныя процімікробныя лек. сродкі, вытворныя аміду *сульфанілавай кіслаты*. Адкрыты Г.*Домагкам* (1935). Прыпыняюць размнажэнне мікраарганізмаў, блакіруюць сінтэз нуклеінавых к-т і бялкоў. Падзяляюцца на прэпараты кароткага (напр., стрэптацыд, этазол, урасульфан), сярэдняга (напр., сульфазін), працяглага (напр., сульфадыметаксін) і звышпра-

цяглага (сульфален) дзеяння. С. мясц. ўжывання: альбуцыд (пры хваробах вачэй), фталазол (пры кішэчных інфекцыях). Ужываюцца пры бранхітах, пнеўманіях, цыстытах, урэтрытах, сальманелёзах, трахоме і інш. *І.М.Семяненя.*

СУЛЬФА́ТЫ, солі і эфіры сернай к-ты H_2SO_4.

С. н е а р г а н і ч н ы я — сярэднія (з аніёнамі SO_4^{2-}) і кіслыя, ці *гідрасульфаты* (з аніёнамі HSO_4^-), солі. Існуюць таксама двайныя С. — солі з 2 рознымі катыёнамі (гл. *Галын*). Сярэднія С. — крышт. рэчывы, пашыраны ў прыродзе, складаюць клас мінералаў, найважн. з іх — *алуніт, ангідрыт, барыт, гіпс, мірабіліт, цэлесцін*, галыны. Добра растваральныя ў вадзе (выключэнне С. барыю $BaSO_4$). З водных растворaў крышталізуюцца ў выглядзе *крышталегідратаў*. Крышталегідраты некат. цяжкіх металаў (медзь, жалеза, цынк) наз. *купарвасамі*. Прыродныя С. выкарыстоўваюць як сыравіну для прамысл. атрымання злучэнняў розных металаў, буд. матэрыялаў і інш., сінт. — у розных галінах прам-сці (гл. *Алюмінію злучэнні, Амонію злучэнні, Барыю злучэнні, Жалеза злучэнні, Калію злучэнні, Кальцыю злучэнні, Натрыю злучэнні*). С. а р г а н і ч н ы я — *эфіры* сернай к-ты: алкілсульфаты — кіслыя эфіры, ці алкілсярныя к-ты (агульная ф-ла $ROSO_3H$), і іх солі ($ROSO_3M$, дзе R — першасны або другасны алкіл, M — натрый, амоній, трыэтыламоній); дыалкілсульфаты — поўныя эфіры ($(RO)_2SO_2$. Высокакіпячыя вадкасці [напр., дыэтылсульфат $(C_2H_5O)_2SO_2$ кіпіць пры 208 °С з раскладаннем] або цвёрдыя рэчывы. Алкілсульфаты добра растваральныя ў вадзе. Дыалкілсульфаты выкарыстоўваюць для *алкіліравання*, солі вышэйшых алкілсульфатаў (R мае 10—18 атамаў вугляроду) — як паверхнева-актыўныя рэчывы рознага прызначэння (аснова сінт. *мыйных сродкаў*, эмульгатары, стабілізатары і інш.).

А.Я.Міляшкевіч.

СУЛЬФГІДРЫ́ЛЬНЫЯ ГРУ́ПЫ, функцыянальныя SH-групы ў малекулах арган. злучэнняў. У бялках уваходзяць у састаў *цыстэіну*.

Валодаюць высокай рэакцыйнай здольнасцю, лёгка акісляюцца і ўтвараюць дысульфідныя сувязі (—S—S—). Забяспечваюць трохмерную структуру малекул, утвараюць вадародныя, дысульфідныя і каардынацыйныя сувязі. Дысульфідныя сувязі жорстка змацоўваюць розныя поліпептыдныя ланцугі або ўчасткі аднаго ланцуга (шмат —S—S-сувязяў у бялках валасоў, пазногцяў, воўны і інш.; некат. гармонах — інсуліне, аксітацыне і інш.). У некат. ферментах (напр., алкагольдэгідрагеназа) С.г. ўтвараюць сувязі паміж бялком і кафактамі, выконваюць каталітычную ролю. Блакада С.г. бялкоў (ферментаў), кафактаў А, напр., цяжкімі металамі, парушае дзяленне клетак, мышачнае скарачэнне, фотасінтэз і інш. *І.М.Семяненя.*

СУЛЬФІ́ДЫ (ад лац. sulphur, sulfur *сера*), хімічныя злучэнні серы з больш электрададатнымі элементамі, пераважна металамі; адносяцца да *металідаў*. Бінарныя С. агульнай ф-лы M_2Sn (M — метал, n — валентнасць металу) могуць разглядацца як солі сераводароднай к-ты H_2S (гл. *Сераводарод*). С. пашыраны ў прыродзе; С. прыродныя — адзін з класаў мінералаў, найб. шырока выкарыстоўваюць — *пірыт, сфалерыт, малібдэніт, кінавар*.

С. падзяляюць на 3 асн. групы. С. шчолачных, шчолачназямельных металаў і магнію — солепадобныя, бясколерныя гідраскапічныя рэчывы. Маюць высокія т-ры плаўлення (напр., С. кальцыю CaS $t_{пл}$ 2525 °С). Многія растваральныя ў вадзе з раскладаннем (гідралізуюцца). У паветры акісляюцца да *сульфатаў*. С. пераходных металаў — крышт. тугаплаўкія рэчывы (напр., С. лантану LaS $t_{пл}$ 2190 °С, цэрыю CeS $t_{пл}$ 2450 °С). Не растваральныя ў вадзе, хімічна ўстойлівыя. С. *р*-элементаў і блізкія да іх С. цынку ZnS, кадмію CdS, ртуці HgS — крышт. рэчывы, нерастваральныя ў вадзе, растваральныя ў мінер. к-тах, акісляюцца ў паветры пры нагрэванні. Шэраг элементаў утварае п о л і с у л ь ф і д ы, у якіх атамы серы злучаныя паміж сабой. Асабліва схільныя да ўтварэння полісульфідаў калій, натрый, амоній і шчолачназямельныя элементы. Пры нагрэванні яны лёгка раскладаюцца на простыя С. і серу. Атрымліваюць С. ўзаемадзеяннем простых рэчываў у вакууме ці інертнай атмасферы, H_2S з металамі, іх аксідамі і гідраксідамі, аднаўленнем сульфатаў. Прыродныя С. выкарыстоўваюць для атрымання металаў, сернай к-ты і сульфатаў (пірыт), сінт. — у гарбарнай прам-сці для дублення скуры (С. барыю BaS, натрыю Na_2S), як люмінафоры і паўправадніковыя матэрыялы (напр., ZnS, CdS), ZnS як кампанент *літапону*, у сельскай гаспадарцы для барацьбы са шкоднікамі (полісульфіды кальцыю і барыю).

Літ.: С а м с о н о в Г.В., Д р о з д о в а С.В. Сульфиды. М., 1972. *А.П.Чарнякова.*

СУЛЬФІ́ДЫ АРГАНІ́ЧНЫЯ, т ы я э ф і р ы, злучэнні агульнай ф-лы RSR′ (R і R′ — арган. радыкалы), *сераарганічныя злучэнні* — аналагі простых *эфіраў*. Да С.а. адносяць таксама цыклічныя злучэнні $R\underbrace{CH(CH_2)_nCHR}S$. Пашыраны ў прыродзе: у нафце большая частка серы знаходзіцца ў выглядзе С.а.; некаторыя прыродныя С.а. (напр., *біяцін, метыянін*) — біялагічна актыўныя рэчывы. Вядомы таксама ды-, тры- і полісульфіды R—S_n—R′, дзе n — колькасць атамаў серы (гл. *Полісульфідныя каўчукі*).

Ніжэйшыя аліфатычныя С.а. — бясколерныя вадкасці (тэхн. маюць непрыемны пах). Добра растваральніках. Больш слабыя асновы, чым простыя эфіры; пры ўзаемадзеянні з дыалкілсульфатамі (гл. *Сульфаты*), алкілсульфанатамі (эфірамі *сульфакіслот*), а таксама са спіртамі ў прысутнасці моцных кіслот утвараюць солі сульфонію (гл. *Оніевыя злучэнні*). Акісляюцца, напр., пераходзяць вадароду да сульфаксідаў (злучэнні агульнай ф-лы RR′SO), канцэнтраванай азотнай к-ты — да сульфонаў (RR′SO_2). Выкарыстоўваюць як адаранты гаручых газаў, антыаксіданты, стабілізатары палівы, змазачных масел і палімераў; дыметылсульфід $(CH_3)_2S$ для атрымання *дыметылсульфаксіду*, дывінілсульфід $(CH_2{=}CH)_2S$ як манамер у выт-сці іонаабменных смол і адсарбентаў. Галагеналкілсульфіды (напр., *іпрыт*) атрутныя. *Я.Г.Міляшкевіч.*

СУЛЬФІ́РАВАННЕ, увядзенне сульфагрупы — SO_2OH у малекулы арган. злучэнняў з утварэннем сувязі вугляроду — сера. Прыводзіць да ўтварэння *сульфакіслот*. Ажыццяўляюць пераважна непасрэдным узаемадзеяннем з сульфіруючымі агентамі: *серная кіслата, олеум*, трыаксід серы SO_3 і яго комплексы з пірыдзінам і дыаксанам, сульфурылхларыд SO_2Cl_2, дыалкілсульфаты і інш. Выкарыстоўваюць пры атрыманні паверхнева-актыўных рэчываў, іонаабменных смол, біялагічна актыўных рэчываў, фарбавальнікаў і інш.

СУЛЬФІ́ТЫ, солі і *эфіры* сярністай к-ты H_2SO_3. Найб. шырока выкарыстоўваюць неарган. С. — сярэднія (з аніёнам SO_3^{2-}) і кіслыя, ці *гідрасульфіты* (з аніёнам HSO_3^-), солі.

Сярэднія С. — крышт. рэчывы, нерастваральныя ў вадзе (акрамя С. шчолачных металаў і амонію). Моцныя аднаўляльнікі; пры нагрэванні ў паветры лёгка акісляюцца да *сульфатаў*. Пры нагрэванні крышт. кіслых С. натрыю і калію ўтвараюцца солі пірасярністай к-ты $H_2S_2O_5$ (у свабодным стане не вылучана) — пірасульфіты $Na_2S_2O_5$ і $K_2S_2O_5$ — крышт. рэчывы, пры t>160 °С раскладаюцца; аднаўляльнікі. Выкарыстоўваюць С. і пірасульфіты пры адбельванні і фарбаванні тканін, валокнаў, скуры, С. кальцыю $[Ca(HSO_3)_2$ і $CaSO_3]$ як дэзінфіцыруючыя сродкі ў вінаробстве і вытв-сці цукру, $K_2S_2O_5$ як кампанент фіксажу ў фатаграфіі, антыаксідант, антысептык.

СУЛЬФО́НАВЫЯ КІСЛО́ТЫ, тое, што *сульфакіслоты*.

СУЛЬФО́НІЕВЫЯ ЗЛУЧЭ́ННІ, гл. ў арт. *Оніевыя злучэнні*.

СУЛЬЯ́НАЎ Анатоль Канстанцінавіч (н. 3.9.1927, с. Аксіньіна Адзінцоўскага р-на Маскоўскай вобл.), бел. пісьменнік. Ген.-маёр авіяцыі (1978). Засл. работнік культ. Беларусі (1986). Скончыў Ваенна-паліт. акадэмію імя Леніна (1962). У арміі з 1946. З 1962 на Поўначы, з 1969 у Гал. паліт. управленні Сав. Арміі ў Маскве, з 1976 у Мінску, чл. ваен. савета арміі Проціпаветранай абароны, у 1980—87 нам. нач. палітупраўлення Бел. ваен. акругі. Друкуецца з 1957. Піша на рус. мове. Аўтар зб-каў апавяданняў, аповесцей, сцэнарыяў, нарысаў «На зямлі і ў паветры» (1967), «Лістапад» (1976), «Прапісаны ў небе» (1978), «Хаджэнне за сёмае неба» (1985), «Толькі адна ноч» (1987), рамана «Расколатае неба» (1981) і інш. пра станаўленне характару ў звычайных і экстрэмальных умовах армейскай службы.

Тв.: Голубые снега: Роман. Кн. 1. Мн., 1990; На критических углах: Роман. М., 1991; Посеешь ветер..: Док. повесть. Мн., 1994; Арестовать в Кремле: Ист. роман. Мн., 2001; Маршал Жуков. Слава, забвение, бессмертие. Мн., 2002.

СУЛЯ́ЦІЧЫ, курганны могільнік *дрыгавічоў* (магчыма, мяшанага дрыгавіцкавалынскага насельніцтва) 11—13 ст. каля в. Суляцічы Навагрудскага р-на Гродзенскай вобл. Захавалася 40 насыпаў дыям. 3—9 м, выш. 0,3—1,5 м. Вакол некаторых ёсць невял. паглыбленні. Даследавалі Ф.Д.Гурэвіч (1956) і К.В.Паўлава (1971). У 2 курганах пахаванні паводле абраду трупаспалення на месцы, 1 без пахавання, у 20 насыпах пахавальны абрад — трупапалажэнне. Знойдзены фрагменты гліняных гаршкоў, сярэбраныя і алавяныя паўтараабаротныя скроневыя кольцы, бронзавыя званочкі, пярсцёнкі і інш.

СУМ (varsinaissuomalaiset — уласна суомі), назва ў рус. летапісах прыбалтыйска-фін. племя суомі, якое ў пач. 1-га тыс. н.э. засяліла паўд.-зах. ўзбярэжжа сучаснай Фінляндыі. З пакарэння С. у сярэдзіне 12 ст. пачалося заваяванне Фінляндыі Швецыяй. Пазней С. разам з ем'ю і зах. карэльскімі плямёнамі ўтварылі фін. народнасць (саманазва suomalaiset — суомі).

СУ́МА (ад лац. summa вынік, агульная колькасць), агульная колькасць, сукупнасць чаго-н.; вынік *складання* велічынь (лікаў, вектараў, мностваў, матрыц і інш.). С. лікаў a і b абазначаецца $a + b$. Для скарочанага запісу С. n лікаў a_1, a_2, ... a_n Л.*Эйлер* прапанаваў (1755) карыстацца сімвалам Σ : $a_1 + a_2 + \ldots + a_n = \sum_{i=1}^{n} a_i$.

СУ́МАРАЎ Васіль Фёдаравіч (н. 7.12.1938, Мінск), бел. жывапісец. Засл. дз. маст. Беларусі (1981). Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1965). У 1965—90 кіраўнік дзіцячай нар. студыі выяўл. мастацтва пры Палацы культуры тэкстыльшчыкаў у Мінску. Працуе ў жанры тэматычнай карціны, пейзажа, нацюрморта. Карціны «Хімічны завод» (1965), «Ліст» (1967), «Раніца. Іней» (1968), «Вяселле» (1972), «Ноч, у якую зацвіў кактус» (1975),



В.**Сумараў**. Свята ў трактарным пасёлку. 1987.

«Дзень нараджэння» (1980), «Дзень радасці» (1983), «Зімовыя радасці» (1985), «Свята ў трактарным пасёлку» (1987) адметныя завершанасцю кампазіцыі і пластычнасцю формы. Лірыка-эпічнае гучанне ўласціва творам: «Песня пра партызан» (1975), «Сказ пра Навагрудак» (1976), «Зямля маці» (1978), «З веку ў век» (1979), «Абуджэнне», «Элегія» (абодва 1981), «Маўклівасць», «Напрадвесні» (абодва 1982), «Пакаянне» (1990). Глыбінная прыгажосць, жыццесцвярджальнасць — гал. рысы палотнаў «Залатыя шары» (1990), «Сон розуму» (1995), «Мелодыя» (1996), «Зіма ў Навагрудку» (1998), «Час цішыні», «Заціша», «Узышоў месяц» (усе 1999), «Зорка надзеі» (2000), «Блакітная веранда» (2001). Прэмія Ленінскага камсамола Беларусі 1982. *Л.Ф.Салавей.*

СУМАРО́КАЎ Аляксандр Пятровіч [25.11.1717 (паводле інш. звестак 1718), каля мяст. Вільманстранд, Фінляндыя — 12.10.1777], рускі пісьменнік; прадстаўнік класіцызму. Скончыў сухапутны шляхецкі корпус (1740), дзе пачаў пісаць вершы. Першы дырэктар



А.П.**Сумарокаў**.

Рас. т-ра ў Пецярбургу (1756—61). Выдаваў першы рус. літ. прыватны час. «Трудолюбивая пчела» (1759). Выступаў як драматург, паэт. тэарэтык л-ры, гісторык, філосаф. Аўтар 9 вершаваных трагедый, у т.л. «Харэў» (1747), «Сінаў і Трувор» (1750), «Дзмітрый Самазванец» (1771); 12 камедый, у т.л. «Трэсаціній» (1750), «Апякун» (1765), «Уяўны рагаросец» (1772). З пастаноўкай яго п'ес звязана з'яўленне першых праф. рас. акцёраў. Аўтар зб-каў «Элегіі», «Сатыры» (абодва 1774), баек (зб. «Прытчы», ч. 1—3, 1762—69), лібрэта опер і балетаў, літ.-крытычных і публіцыстычных артыкулаў.

Тв.: Избр. произв. Л., 1957; Драматические соч. Л., 1990; Бел. пер. — Крыж і абраз. Мн., 1930.

СУМА́ТАР л і ч б а в ы, асноўны вузел *арыфметычнага прыстасавання ЭВМ* ці асобная прылада, што непасрэдна выконвае аперацыю *складання* лікаў. Характарызуецца хуткадзеяннем (часам складання 2 лікаў) і апаратнымі затратамі. Выконваецца на транзістарах, лагічных элементах і інтэгральных схемах.

Схемы С. адрозніваюцца спосабам паступлення разрадаў аператараў, прынятай сістэмай лічэння, прынцыпам работы, спосабам перадачы адзінкі пераносу і логікай работы. Шматразрадныя С. будуюцца з 1-разрадных. Разрады ўведзеных лікаў складаюцца адначасова ва ўсіх 1-разрадных С., біты пераносу з папярэдніх разрадаў у наступныя перадаюцца ланцужкова, адначасова ці інакш, у залежнасці ад спосабу злучэння 1-разрадных С. Дзеянні над кодамі лікаў і каманд (адніманне, множанне, дзяленне, мадыфікацыя і інш.) зводзяцца да аперацый складання і зруху. Характарыстыкі С. вызначаюць многія параметры ЭВМ. *Л.В.Сільноў.*

СУМА́ТРА (Sumatra, Sumatera), востраў у зах. частцы Малайскага архіпелага, у складзе *Вялікіх Зондскіх астравоў*, тэр. Інданезіі. Пл. каля 435 тыс. км^2. Нас. каля 40 млн. чал. (2000). Даўж. з ПнЗ на ПдУ каля 1700 км. Берагавая лінія слаба парэзаная, уздоўж узбярэжжа трапляюцца каралавыя рыфы. Зах. ч. вострава занята сістэмай гор Барысан (выш. да 3805 м, вулкан Керынчы), на У — забалочаныя раўніны. Горы складзены пераважна з палеазойскіх метамарфічных парод з гранітнымі інтрузіямі, развіты эфузійна-асадкавыя адклады мезазою і кайназою, латэрыты. Радовішчы нафты, прыроднага газу, вугалю, золата, марганцу. Клімат экватарыяльны. Сярэднегадавая т-ра на раўнінах 25—27 °С, ападкаў 1500—3000 мм (у гарах месцамі больш за 6000 мм) за год. Густая рачная сетка. Асн. рэкі: Мусі, Хары, Індэрагіры, Кампар. Буйное воз. Тоба. Пад лесам каля 70% тэр. На раўнінах шмат'ярусныя трапічныя лясы, уздоўж узбярэжжа — мангравыя зараснікі, у гарах — лясы з вечназялёнага дубу, каштану, зараснікі лаўру, буку, хвойных і інш. парод. У фауне трапляюцца двухрогі насарог, інд. слон, малайскі мядзведзь, арангутанг, гібон, чапрачны тапір і інш. Нац. парк Гунунг-Лёсер, запаведнікі. Плантацыі рысу, каўчуканосаў, какосавых пальмаў, кавы. Асн. гарады: Палембанг, Паданг, Медан.



Плантацыі алейнай пальмы на востраве **Суматра**.

СУ́МАЎКА, возера ў Міёрскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Вята, за 8 км на ПдЗ ад г. Міёры. Пл. 1,63 км^2, даўж. 2,4 км, найб. шыр. 680 м, найб. глыб. 29,9 м, даўж. берагавой лініі 6 км, пл. вадазбору 14,4 км^2. Катлавіна лагчыннага тыпу, складаецца з 2 плёсаў — глыбакаводнага зах. Гоўцы і ўсх. Сумаўка (глыб. 15,8 м). Схілы выш. 1—5 м, на Пд і ПдЗ разараныя, месцамі пад хмызняком. Берагі нізкія, пад хмызняком, месцамі забалочаныя, на Пн і З участкамі да 0,8 м, на У зліваюцца са схіламі. Прыбярэжная зона пясчаная, глыбей дно ілістае. Шыр. паласы расліннасці да 15 м. Упадае ручай з возера без назвы, выцякае ручай у воз. Сярэднік.

СУМА́Х, ж а ў т у ш н і к (Rhus), род кветкавых раслін сям. анакардыевых. Каля 150 (паводле інш. звестак да 250)

відаў. Пашыраны ва ўмераным поясе і субтропіках. На Беларусі інтрадукаваны 4 віды С.: аленярогі, ці пушысты, або воцатнае дрэва (R. typhina), духмяны (R. aromatica), трохлопасцевы (R. trilobata), ядавіты (R. toxicodendron).

Лістападныя або вечназялёныя кусты ці невял. дрэвы выш. да 12 м, радзей ліяны. Лісце чаргаванае, буйное, трайчастае або непарнаперыстае, ярка-чырв. ўвосень. Кветкі дробныя, шматлікія, сабраныя ў мяцёлчатыя суквецці. Плод — касцянка. У лісці і кары ёсць дубільныя рэчывы. З соку некат. відаў (ядавіты, выклікае апёкі) атрымліваюць лак, з пладоў — воск. Лек., тэхн., дэкар. расліны.

І.М.Гарановіч.



1



2

Сумах: 1 — кітайскі; 2 — паслядоўны.

СУМА́ЦЫЯ ў фізіялогіі, узаемадзеянне сінаптычных працэсаў (што ўзбуджаюць ці затарможваюць) на мембране нейрона або мышачнай клеткі, якое характарызуецца ўзмацненнем эфектаў раздражнення да рэфлекторнай рэакцыі ў адказ; адзін з механізмаў кардынавання рэакцый арганізма. Апісана І.М.*Сечанавым* у 1868. На сістэмным узроўні адрозніваюць С. прасторавую і часавую. Прасторавая С. адбываецца ў выпадку адначасовага ўздзеяння аферэнтных раздражненняў, кожнае з якіх неэфектыўнае для розных рэцэптараў адной і той жа рэцэптыўнай зоны (напр., узбуджэнне многіх нейронаў розных участкаў мозга). Часавая С. вызначаецца ўзаемадзеяннем нерв. уплываў, што прыходзяць з пэўным інтэрвалам да адных і тых жа ўзбудлівых структур па адных і тых жа нерв. каналах. Забяспечвае неабходную працягласць рэакцый і можа падтрымлівацца кальцавой сувяззю нейронаў. На клетачным узроўні С. мае прасторава-часавы характар.

С.С.Ермакова.

СУ́МБА (Sumba), востраў у складзе *Малых Зондскіх астравоў*, тэр. Інданезіі. Пл. 11,2 тыс. км². На Пд і ў цэнтры расчлянёныя нізкагор'і (выш. да 1225 м), складзеныя з вулканічных і крышт. парод, перакрытых неагенавымі мергелямі і вапнякамі; на Пн алювіяльная раўніна. Клімат субэкватарыяльны мусонны, ападкаў ад 1500 мм на раўнінах, да 2500 мм у гарах за год. Сухі сезон з ліп. па кастрычнік. Другасныя саванны і рэдкалессі, у гарах вечназялёныя лясы. На прыбярэжных раўнінах трапічнае земляробства: вырошчванне рысу, какосавай пальмы, тытуню. Вытв-сць копры. Гал. г. — Вайнгапу.

СУМБА́ВА (Sumbawa), востраў у складзе *Малых Зондскіх астравоў*, тэр. Інданезіі. Пл. каля 13,3 тыс. км². Нас. каля 1 млн. чал. (2000). Берагі моцна расчлянёныя, шмат бухтаў, каля ўзбярэжжа каралавыя рыфы. Рэльеф гарысты, выш. да 2821 м (вулкан Тамбора). Клімат субэкватарыяльны, мусонны. Ападкаў каля 1200 мм за год; засушлівы сезон на працягу 6 мес. Трапічныя лясы, хмызняковыя зараснікі і саванны. Вырошчваюць рыс, кукурузу, сою, какосавыя пальмы, тытунь, каву. Жывёлагадоўля, у т.л. конегадоўля. Рыбалоўства. На С. — гарады Сумбавабесар, Раба.

СУМБАТАШВІ́ЛІ Іосіф Георгіевіч (н. 10.11.1915, Тбілісі), грузінскі тэатр. мастак. Нар. маст. СССР (1982). Вучыўся ў Тбіліскай АМ (1936—42). У 1942—47 гал. мастак Груз. т-ра оперы і балета імя З.Паліяшвілі, у 1948—59 — Т-ра імя К.Марджанішвілі ў Тбілісі (афарміў спектакль «Яго зорка» І.Масашвілі, 1951; Дзярж. прэмія СССР 1952), у 1962—72 — Цэнтр. т-ра Сав. Арміі, у 1972—88 — Т-ра імя Я.Вахтангава ў Маскве. Афармляў таксама спектаклі ў Маскоўскім маст. акад. т-ры («Сталявары» Г.Бокарава, 1972, Дзярж. прэмія СССР 1974) і інш. Творчасці ўласцівы лаканізм афармлення сцэн. прасторы ў кантрастным супастаўленні з экспрэсіўнай маляўнічасцю касцюмаў.

СУМГАЙТ, горад на У Азербайджана, на ўзбярэжжы Каспійскага м., у вусці р. Сумгаіт. Узнік у 1949 на месцы вёскі ў сувязі з развіццём прам-сці. Каля 300 тыс. ж. (2001). Чыг. ст., вузел аўтадарог. Важны прамысл. цэнтр Азербайджана (другі пасля Баку). Прам-сць: хім. (з-д сінтэтычнага каўчуку, ВА «Хімпрам»), металургічная (трубапракатны і алюмініевы з-ды), маш.-буд., лёгкая, харч., буд. матэрыялаў. ЦЭС. Музей гісторыі горада. Тэатр.

СУМГА́НСКАЯ ПЯЧО́РА, адна з найбольш доўгіх вапняковых пячор Урала, у Башкортастане, Расія. Знаходзіцца на зах. схіле хр. Кібіз (Паўд. Урал). Даўж. каля 8 км. Складаецца з 3 ярусаў; вызначаецца вял. памерамі гротаў і багаццем нацечных утварэнняў. Ёсць падземныя азёры. Помнік прыроды.

СУМЕ́ЖНЫЯ ВУГЛЫ́, вуглы, у якіх адна старана агульная, а інш. стораны ляжаць на адной прамой.



Сумежныя вуглы.

СУМЕ́ЖНЫЯ ПРАВЫ́, разнастайнасць выключных правоў, якія з'яўляюцца вытворчымі ад *аўтарскага права*, але цалкам з ім не супадаюць. Рэгулююць адносіны, што ўзнікаюць у сувязі з выкананнем, пастаноўкай літ. і муз. твораў, у т.л. запісаных на фанаграму, перадачы арганізацый эфірнага і кабельнага вяшчання. Неабходнасць прававой аховы С.п. абумоўлена тым, што развіццё навук. тэхн. прагрэсу закранае не толькі ўладальнікаў аўтарскага права, але і тых асоб, чыя дзейнасць звязана з выкарыстаннем твораў, якія ахоўваюцца гэтым правам. У выніку таго, што магчымасць рэпрадуктавання дазволіла ствараць высакаякасныя копіі з існуючых запісаў, узнікла неабходнасць у ахове інтарэсаў суб'ектаў С.п.: выканаўцаў (адносна іх выканання), вытворцаў фанаграм (адносна іх гукавых праграм), вяшчальных арганізацый (адносна транслюемых імі праграм). Асн. змест С.п. зводзіцца да таго, што выкарыстанне трэцімі асобамі фанаграм, радыё- і тэлепраграм, а таксама творчых вынікаў выканаўцаў патрабуе згоды або артыста, які ажыццяўляе выкананне, або аргцый, якія зрабілі гуказапіс, або радыё- і тэлеарганізацый. Пытанні рэалізацыі С.п. і іх аховы ў Рэспубліцы Беларусь рэгулюецца цывільным заканадаўствам.

Э.І.Кузьмянкова.

СУМЕ́СНАЕ ПРАДПРЫЕ́МСТВА, прадпрыемства, у рабоце якога ўдзельнічаюць фірмы або фізічныя асобы ін-

шых краін, арганізацыйна аформленае як адзінае. Ствараюцца для аб'яднання намаганняў у больш эфектыўнай вытв-сці і збыце прадукцыі, прыцягнення ў эканоміку замежнага капіталу, абмену вопытам арганізацыі працы і вытв-сці, асваення рыначных адносін і знешняга рынку. Статутны фонд С.п. ствараецца за кошт укладаў партнёраў, можа папаўняцца з прыбыткаў ад гасп. дзейнасці, або пазыковых сродкаў. Кіраўніком С.п. можа быць і грамадзянін дзяржавы-заснавальніцы, і замежны. Пытанні найму, звальнення, аплаты працы вырашаюцца С.п. Пры ліквідацыі С.п. або выхадзе з яго замежны ўдзельнік мае права пасля пагашэння наяўных абавязацельстваў на вяртанне свайго ўкладу ў грашовай або таварнай форме.

СУМЕ́СНАЯ ЎЛА́СНАСЦЬ, гл. ў арт. *Агульная ўласнасць.*

СУ́МКА, а с к, спараносны орган, у якім развіваюцца споры *сумчатых грыбоў*; аднаклетачная структура, якая мае фіксаваную колькасць *сумкаспор* (звычайна 8). Утвараецца з *зіготы* (ніжэйшыя аскаміцэты) або на аскагенных гіфах, што развіваюцца з зіготы.

СУМКАСПО́РА, а с к а с п о р а, спора палавога размнажэння *сумчатых грыбоў*. Гаплоідныя С. ўтвараюцца ў *сумцы* пасля зліцця ядраў зіготы і меятычнага дзялення дыплоіднага ядра.

СУМЛЕ́ННЕ, катэгорыя *этыкі*, якая ахоплівае праблемы маральнага самакантролю асобы; здольнасць чалавека фармуляваць для сябе маральныя абавязкі, патрабаваць ад сябе іх выканання і ажыццяўляць *самаацэнку* сваіх учынкаў; форма маральнай *самасвядомасці*. Можа выяўляцца і ў рацыянальнай форме ўсведамлення асобай маральнага значэння сваіх дзеянняў, і ў форме эмацыянальных перажыванняў.

У стараж.-грэч. міфалогіі С. адлюстравана ў выглядзе эрыній — божаствоў помсты і пакарання, якія праследуюць злачынцаў. У этыцы праблему С. ўпершыню паставіў Сакрат, які лічыў самапазнанне крыніцай маральнасці чалавека. У хрысц. этыцы С. разглядалася як унутр. ўсведамленне Божай волі. Філосафы-матэрыялісты 17—18 ст. (Дж.Лок, Б.Спіноза, Т.Гобс), звязвалі С. з грамадскім выхаваннем і адмаўлялі прыроджаны характар С. Індывідуалістычную трактоўку С. прапанавалі Ж.Ж.Русо, І.Кант, І.Фіхтэ, якія лічылі С. прыроджанай уласцівасцю кожнага чалавека. Л.Феербах наз. С. «другім Я» чалавека, а вытокі С. бачыў у грамадскіх маральных нормах. Прадстаўнікі марксізму сцвярджалі, што С. дэтэрмінуецца ўмовамі жыццядзейнасці чалавека і яго грамадскай пазіцыяй. У экзістэнцыялізме С. разглядалася як адзіны крытэрый маральнасці, стымул да ажыццяўлення абсалютна свабоднага выбару без уліку аб'ектыўных фактараў (М.Хайдэгер, Ж.П.Сартр). Ням. філосаф В.Віндэльбанд акрамя этычнага вылучаў С. лагічнае і эстэт. як формы самакантролю не толькі ўчынкаў, але і мыслення і пачуццяў.

СУ́МНІК, з а л а т а ц е н ь (Solidago), род кветкавых раслін сям. складанакветных. Каля 120 відаў. Пашыраны ў Паўн. Амерыцы, некалькі відаў у Паўд. Амерыцы і Еўразіі. На Беларусі 1 від — С. звычайны, або залатая розга (S. virgaurea). Трапляецца ў лясах, на ўзлесках, палянах. Інтрадукаваны С. канадскі (S. canadensis) і позні (S. serotina), якія часта дзічэюць.

Шматгадовыя травяністыя расліны і паўкусты. Сцёблы прамастойныя, густааблісцелыя. Лісце чаргаванае, ланцэтнае, сядзячае ці кароткачаранковае. Кветкі залаціста-жоўтыя ў дробных шматлікіх кошыках, сабраных у аднабокую мяцёлку або гронка- ці шчыткападобнае суквецце. Плод — сямянка. Лек., фарбавальныя, меданосныя і дэкар. расліны.

А.М.Скуратовіч.



Сумнік: 1 — звычайны; 2 — канадскі.

СУ́МНІКАВА (дзявочае С в і р ы д з е н к а) Ірына Уладзіміраўна (н. 15.10.1964, Мінск), бел. спартсменка (баскетбол). Засл. майстар спорту СССР (1991). Чэмпіёнка XXV Алімп. гульняў (1992, г. Барселона, Іспанія), бронз. прызёр XXIV Алімп. гульняў (1988, Сеул). Сярэбраны прызёр чэмпіянату свету (1986). Чэмпіёнка Еўропы (1989, 1991), бронз. прызёр (1995). З 2000 у Расіі.

СУМО́, від нацыянальнай яп. барацьбы; адзін з відаў адзінаборстваў. Паядынкі адбываюцца на спец. памосце ў крузе дыям. 4,6 м. Мэта паядынку — выціснуць саперніка за межы круга або прымусіць яго дакрануцца да памоста якой-н. ч. цела, акрамя ступні. Найб. важнымі кампанентамі ў С. з'яўляюцца маса і рост спартсмена, яго здольнасць захаваць устойлівасць і раўнавагу, а таксама спрыт і раптоўнасць. Узнікла ў Японіі каля 8 ст. У сучасным выглядзе існуе з 19 ст.

СУ́МСКАЯ ВО́БЛАСЦЬ. Размешчана на ПнУ Украіны. На Пн і У мяжуе з Рас. Федэрацыяй. Утворана 10.1.1939. Пл. 23,8 тыс. км^2. Нас. 1349 тыс. чал. (1999), гарадскога 60%. Цэнтр — г. *Сумы*. Найб. гарады: Канатоп, Шостка, Рамны, Ахтырка, Глухаў, Лебядзін.

Большая ч. тэр. вобласці знаходзіцца ў межах Прыдняпроўскай нізіны, на У і ПнУ — Сярэднярускае ўзв. (выш. да 226 м). Паверхня — хвалістая раўніна, парэзаная далінамі рэк, ярамі. Карысныя выкапні: нафта, прыродны газ, буры вугаль, фасфарыты, мел, калійныя і каменныя солі, вапнякі, гіпс і інш. Клімат умерана кантынентальны. Сярэдняя т-ра студз. -7 °С, ліп. 19 °С, ападкаў каля 600 мм за год. Рэкі бас. р. Дняпро: Дзясна з прытокам Сейм, Сула, Псёл, Ворскла. У далінах — шматлікія азёры і сажалкі. Глебы на Пн дзярново-падзолістыя, на Пд — чарназёмы. Пад лесам і хмызнякамі каля 17% тэр., на Пн мяшаныя лясы (хвоя, бяроза, дуб), у цэнтры і на Пд лясы з ліпы, клёну, ясеню. Стэпы пераважна разараныя. У вобласці філіял Укр. стэпавага запаведніка — Міхайлаўская цаліна. Дэндрапарк Трасцянец.



Асн. галіны прам-сці: машынабудаванне і металаапрацоўка (абсталяванне для хім. і горнай прам-сці, помпы для цеплавых і атамных электрастанцый, кампрэсары, поршні, паліграф. машыны, электратэхн. і агрэгатныя вузлы, аўтам. тэлефонныя станцыі, электрабыт. прылады), хім. (мінер. ўгнаенні, серная к-та, кіна- і фотаплёнка, гумава-тэхн. вырабы), лясная і дрэваапр., у т.л. мэблевая, лёгкая (тэкст., швейная, гарбарна-абутковая), харч. (цукр., мукамольная, мяса-малочная, алейная), камбікормавая, фарфора-фаянсавая. Вытв-сць буд. матэрыялаў. Здабыча нафты і прыроднага газу. Вытв-сць электраэнергіі на Сумскай, Ахтырскай, Шосткінскай і Канатопскай ЦЭЦ. Сельская гаспадарка спецыялізуецца на вырошчванні цукр. буракоў, збожжавых і на мяса-малочнай жывёлагадоўлі. Пасяўныя пл. займаюць

402 тыс. га (1999). Сеюць пшаніцу, жыта, ячмень, кукурузу, цукр. буракі, сланечнік, каноплі. Бульбаводства, агародніцтва. Развіта садоўніцтва. Гадуюць буйн. раг. жывёлу, свіней, авечак і коз, птушак. Пчалярства. Рыбаводства. Даўж. чыгунак 823 км, аўтадарог з цвёрдым пакрыццём каля 5 тыс. км. Асн. чыгунка Кіеў—Канатоп—Сумы—Харкаў, аўтадарогі Кіеў—Сумы—Курск, Сумы—Харкаў.

СУ́МЧАТЫ ВОЎК, тасманійскі воўк, тылацын (Thylacinus cynocephalus), сумчатае млекакормячае, адзіны прадстаўнік сям. тылацынавых. Быў пашыраны ў Аўстраліі; пасля распаўсюджання там сабакі *дынга* захоўваўся да пач. 20 ст. толькі на в-ве Тасманія. Трапляўся ў лясістай мясцовасці. Апошнія звесткі пра С.в. адносяцца да 1940-х г.; верагодна, вынішчаны. Занесены ў Чырв. кнігу МСАП.



Сумчаты воўк.

Даўж. цела да 130 см, хваста да 65 см. Афарбоўка шэра-жаўтаватая, па баках задняй ч. тулава 16—18 карычневых палос. Іклы і карэнныя зубы моцна развітыя. Тулава падоўжанае, канечнасці адносна кароткія, пальцаходныя, на задніх 1-ы палец адсутнічае. Вывадковая сумка адкрываецца назад. Нараджалася да 4 дзіцянят, выношваліся ў сумцы да 3 мес. *Э.Р.Самусенка.*

СУ́МЧАТЫ МЯДЗВЕ́ДЗЬ, млекакормячае сям. каалавых, гл. *Каала*.

СУ́МЧАТЫЯ (Marsupialia), атрад млекакормячых інфракласа ніжэйшых звяроў (Metatheria). 2 падатр., 9 (16) сям., каля 250 відаў. Вядомы з ніжняга мелу Паўн. Амерыкі (каля 190 млн. г. назад). Пашыраны пераважна ў Аўстраліі, а таксама на а-вах Вял. Зондскія, Тасманія, Н.Гвінея, у Паўд., Цэнтр. і Паўн. Амерыцы; акліматызаваны ў Н.Зеландыі. Насяляюць разнастайныя ландшафты і вадаёмы. Сярод інш. да С. адносяцца: *апосумы, вамбат, каала, кенгуровыя, цэналеставыя*. 33 віды ў Чырв. кнізе МСАП.

Даўж. ад 4 да 300 см, маса да 90 кг. Раслінаедныя, насякомаедныя, драпежныя, ёсць усёедныя. Размнажэнне ад 1 да некалькіх разоў за год. Самкі большасці відаў маюць вывадковую сумку (адсюль назва), у якую адкрываюцца саскі (2—6) малочных залоз. Дзіцяняты нараджаюцца слабаразвітымі і развіваюцца ў сумцы (да 250 сут), дзе прымацоўваюцца да саска, з якога малако выпырскваецца пры скарачэнні спец. мышцаў.

Літ.: Соколов В.Е. Систематика млекопитающих. М., 1973; Жизнь животных. Т. 7. 2 изд. М., 1989; Акимушкин И.И. Мир животных: Млекопитающие, или звери. 4 изд. М., 1998. *Э.Р.Самусенка.*

СУ́МЧАТЫЯ ГРЫБЫ́, (Ascomycota), аддзел грыбоў. 2 кл.: аскаміцэты і эндааскаміцэты. Да С.г. адносяць амаль усе грыбы, што ўваходзяць у склад лішайнікаў. Пашыраны ўсюды. Аскаміцэты падзяляюцца на 3 падкл., маюць каля 20 парадкаў, каля 30 тыс. відаў. На Беларусі больш за 10 парадкаў, каля 200 родаў, каля 500 відаў. Трапляюцца ў глебе і на арган. субстратах. Сапратрофы, раскладаюць расл. і жывёльныя рэшткі, утвараюць плесні на прадуктах харчавання, прамысл. матэрыялах і вырабах. Многія паразіты, узбуджальнікі хвароб жывёл і чалавека (напр., *мікозы*), раслін (*мучністай расы, паршы*, плямістасцей і інш.). Ёсць ядомыя (*смаржкі, страчкі, трыфелі*).

Міцэлій галінасты, шматклетачны, складаецца са шмат'ядзерных або аднаядзерных клетак. У некат. С.г. (напр., дражджэй) сапраўдны міцэлій адсутнічае, ёсць толькі асобныя клеткі, здольныя пачкавацца. Размнажэнне вегетатыўнае (часткамі міцэлію), бясполае (*канідыямі*) і палавое (*сумкаспорамі*). У выніку палавога працэсу ўтвараюцца *сумкі* (адсюль назва) у выглядзе мяшочка з адтулінай, звычайна 8-споравыя, аднаклетачныя. У ніжэйшых С.г. сумкі знаходзяцца непасрэдна на міцэліі, у вышэйшых — размешчаны ў пладовых целах (*апатэцыях, клейстатэцыях* і *перытэцыях*). У цыкле развіцця многіх С.г. адзначана канідыяльнае споранашэнне, якое мае выгляд плям, бугаркоў, налётаў. *Канідыяносцы* ўзнікаюць адзіночна, кучкамі або суцэльным слоем на шчыльным спляценні міцэлію ці ў *пікнідах*. Выкарыстоўваюцца ў сыраварэнні, хлебапячэнні і ў мікрабіял. прам-сці як прадуцэнты ферментаў, антыбіётыкаў і інш.

Літ.: Стрельская О.Я. Низшие растения. Систематика. Мн., 1985; Грин Н., Стаут У., Тейлор Д. Биология: Пер. с англ. Т. 1—3. М., 1990; Мюллер Э., Леффлер В. Микология: Пер. с нем. М., 1995. *С.І.Бельская.*



Сумчатыя: 1 — трусіны бандыкут; 2 — хобатнагаловы кускус; 3 — плямістахвостая сумчатая куніца; 4 — плямісты кускус; 5 — сумчаты д'ябал; 6 — карлікавая сумчатая мыш; 7 — сумчаты крот.

СУ́МЫ, горад, цэнтр Сумскай вобл. Украіны, на р. Псёл. 298 тыс. ж. (1999). Чыг. ст., вузел аўтадарог. Аэрапорт. Прам-сць: маш.-буд. (машынабуд. НВА; ВА «Помпаэнергамаш»; з-ды электронных мікраскопаў, «Сумсельмаш», «Цэнтраліт»), хім. (ВА «Хімпрам» і «Гуматэхніка»), харчовая (цукрова-рафінадны з-д, мясакамбінат і інш.), лёгкая (суконная, воўнапрадзільная, абуткавая, швейная ф-кі і інш.), мэблевая, буд. матэрыялаў. Пед. ін-т. Тэатры. Музеі: краязнаўчы, мастацкі, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, дом-музей А.П.Чэхава. Арх. помнікі 18—19 ст.: царква Уваскрэсення (1703), Спаса-Праабражэнскі сабор (1776), Ільінская царква (1836).

Засн. ў 1652. У 1656—58 пабудавана крэпасць для абароны *Слабадской Украіны* і Паўд. Расіі ад набегаў крым. і нагайскіх татараў. У 1658—1765 цэнтр Сумскага слабадскога палка. У Паўн. вайну 1700—21 у С. у 1708—09 знаходзілася Стаўка галоўнакамандавання рус. арміі на чале з Пятром I. З 1765 цэнтр Сумскай прав., з 1780 павятовы горад Харкаўскага намесніцтва, з 1796 Слабодска-Украінскай, з 1835 Харкаўскай губ. У 1877 злучаны чыгункай з Любацінам і Варажбой. З 1939 абл. цэнтр. У Вял. Айч. вайну акупіраваны (1941—43) нямецкімі фашыстамі, адзін з цэнтраў партыз. руху.

СУМЯШЧА́ЛЬНАСЦЬ псіхалагічная, аптымальнае спалучэнне (падабенства або ўзаемадапаўняльнасць) і несупярэчлівасць псіхал. якасцей двух або некалькіх людзей. Адна з умоў інтэграцыі і яднання групы, калектыву, правільнага падбору лідэраў і кіраўнікоў. Асобае значэнне набывае ў складаных умовах сумеснай жыццядзейнасці (касмічны палёт, экспедыцыя, альпінісцкі паход і інш.). Забяспечвае высокі ўзровень эфектыўнасці сумеснай дзейнасці. Несумяшчальнасць можа стаць перадумовай канфліктаў і зрываў у агульнай рабоце. Праверка на С. праводзіцца пры дапамозе спец. апаратуры і практычных дзеянняў.

СУМЯШЧА́ЛЬНАСЦЬ ЭВМ, здольнасць *электронных вылічальных машын* розных тыпаў да ўзаемадзеяння. Адрозніваюць С. апаратную, праграмную і інфармацыйную. Поўная С. ЭВМ дадзеных тыпаў бывае пры існаванні адначасова С. усіх відаў.

А п а р а т н а я (тэхн.) С. — здольнасць ЭВМ дадзенага тыпу працаваць з прыладамі ці вузламі ЭВМ інш. тыпу. У т.л. разглядаецца эл.-магн. С., калі тэхн. сродкі не ствараюць узаемных эл.-магн. перашкод або іх уласнае эл.-магн. выпрамяненне істотна не ўплывае на работу інш. тэхн. сродкаў. П р а г р а м н а я С. — магчымасць выканання адных і тых жа *праграм* на ЭВМ розных тыпаў пры атрыманні аднолькавых вынікаў. С. праграм — калі яны прыдатныя да аб'яднання ў складаныя праграмныя комплексы. І н ф а р м а ц ы й н а я С. — здольнасць ЭВМ розных тыпаў ідэнтычна ўспрымаць пэўны набор даных. Для яе забеспячэння дастаткова С. фарматаў прадстаўлення даных. *М.П.Савік.*

СУМЯШЧА́ЛЬНІЦТВА, выкананне работнікам апрача сваёй асноўнай іншай работы, якая рэгулярна аплачваецца, на ўмовах прац. дагавора. Паводле заканадаўства Рэспублікі Беларусь сумяшчальнікам можа быць любы работнік незалежна ад яго спецыяльнасці, кваліфікацыі, памеру зарплаты. С. дапускаецца і па месцы асн. работы, і ў інш. прадпрыемстве, установе, арг-цыі. Пры С. забараняецца прыём на работу цяжарных жанчын і асоб, якія не дасягнулі 18 гадоў, а таксама сумесная служба сваякоў, звязаная з непасрэднай падпарадкаванасцю і падкантрольнасцю, і ў некат. інш. выпадках. Парадак афармлення на работу па С. рэгулюецца заканадаўствам. *Г.А.Маслыка.*

СУН, дынастыя і імперыя ў Кітаі ў 10—13 ст. Заснавальнік С., палкаводзец Чжао Куанінь захапіў у 960 уладу і абвясціў сябе імператарам Тайцзу [960—976], чым скончыў перыяд смут пасля падзення дынастыі *Тан*. Яго пераемнік Тайцзун [976—997] канчаткова аб'яднаў Кітай пад уладай С.; спыненне міжусобіц спрыяла хуткаму эканам. ўздыму краіны, росквіту кіт. сярэдневяковай культуры. Развівалася філасофія ў выглядзе неаканфуцыянства Чжу Сі. Але імператары цярпелі няўдачы ў барацьбе з паўн. качэўнікамі — *кіданямі*, тангутамі (гл. *Сі-Ся*), з-за чаго вымушаны былі плаціць ім даніну. Хуткі рост насельніцтва і недахоп ворных зямель прывялі ў канцы 11 ст. да росту сац. напружанасці. З мэтай яе памяншэння першы міністр Ван Аньшы правёў у 1069—85 шэраг рэформ, якія ўладкавалі сістэму падаткаў і землекарыстання; прыняты захады па асваенні свабодных зямель на Пд. У пач. 12 ст. на Пн Кітая ўварваліся *чжурчжэні*, якія ў 1127 захапілі сталіцу імперыі г. Бянь (цяпер Кайфын). Сунскі прынц Гаоцзу [1127—62] аднавіў імперыю С., якая ахоплівала толькі Паўд. Кітай. Паводле дагавора 1141, С. прызнала сябе васалам дзяржавы чжурчжэняў — імперыі *Цзінь*. На працягу некалькіх дзесяцігоддзяў С. вяла барацьбу супраць манголаў (гл. *Мангольскія заваяванні*), якія ў 1279 знішчылі імперыю.

СУ́НА (ад араб. звычай, паводзіны, лад дзеянняў), свяшчэннае пісанне *ісламу*, выкладзенае ў 2-й пал. 7 — пач. 8 ст. ў апавяданнях (хадысах) пра ўчынкі і выказванні прарока *Мухамеда*. У ісламе С. надаецца значэнне крыніцы, якая тлумачыць і дапаўняе *Каран* і служыць другой (пасля Карана) асновай мусульм. права. Шэсць зборнікаў С. кананічныя; гал. з іх складзены аль-Бухары (810—870) і Муслімам (817—875). Побач з пераважна легендарным матэрыялам у С. ёсць гіст. звесткі, якія характарызуюць працэсы развіцця ісламу і становішча розных сац. слаёў у першыя 2 ст. Халіфата. Сучаснае мусульм. багаслоўе пры тлумачэнні С. звычайна мадэрнізуе яе.

СУ́НГАРЫ, С у н х у а ц з я н, рака на ПнУ Кітая, правы прыток р. Амур. Даўж. 1870 км, пл. бас. 524 тыс. км². Пачынаецца на пласкагор'і Чанбайшань, перасякае Маньчжура-Карэйскія горы, раўніны Сунляо і Саньцзян, дзе падзяляецца на рукавы, меандруе. Асн. прытокі: Нуньцзян (злева), Муданьцзян (справа). Разводдзе летам, бываюць катастрафічныя наводненні. Сярэдні расход вады каля 2500 м³/с. У вярхоўях Фынманьская ГЭС з вадасховішчам (даўж. каля 150 км). На С. — гарады Гірын (пач. суднаходства), Харбін, Цзямусы.

СУ́НДСВАЛЬ (Sundsvall), горад на У Швецыі. Засн. ў 1621. Каля 110 тыс. ж. (2001). Порт на Батнічным зал. Балтыйскага м. (вываз лесапапяровай прадукцыі), чыг. ст., вузел аўтадарог. Аэрапорт. Прам-сць: цэлюлозна-папяровая, маш.-буд., алюмініевая.

СУНДУКЯ́Н Габрыэл Мкртычавіч (11.7.1825, Тбілісі — 29.3.1912), армянскі драматург, пісьменнік; адзін з арганізатараў арм. т-ра. Скончыў Пецярбургскі ун-т (1850). Аўтар п'ес «Начное чыханне — на дабро» (паст. 1863), «Перапалох» («Хатабала»), «Аскан Пятровіч на тым свеце» (абедзве паст. 1866), «Іншыя, або Новы Дыяген» (паст. 1869), «Яшчэ адна ахвяра» (паст. 1870), «Пэпа» (паст. 1871), «Разбураны ачаг» (паст. 1873), «Муж і жонка» (паст. 1888), «Каханне і свабода» (1910), «Завяшчанне» (1912). С. вывеў жанр камедыі з рамак быт. водэвіля і ўзняў да ўзроўню сац. абагульненняў. Аўтар аповесці «Вараньчын вечар» (1877), публіцыст. фельетонаў «Гутаркі Амала» і «Гутаркі Адыда». Імя С. нададзена Арм. драм. т-ру (Ерэван).

Тв.: Рус. пер. — Избранное. М., 1953.

Літ.: А б о в Г. Габриел Сундукян. Ереван, 1956.

СУНІ́ЗМ, кірунак у *ісламе*, які мае найбольшую колькасць паслядоўнікаў у мусульм. краінах (акрамя Ірана і Ірака). Склаўся ў 10—11 ст. і развіваўся як плынь, процілеглая *шыізму*, ад якога адрозніваецца адмаўленнем магчымасці пасрэдніцтва паміж Алахам і людзьмі пасля смерці *Мухамеда*, непрызнаннем асаблівай прыроды Алі і права яго нашчадкаў на імамат (гл. *Імам*). Агульнапрызнанага зводу догматаў не мае. Паслядоўнікі С. — суніты (ахль ас-суна валь-джама — людзі суны і згоды абшчыны) прытрымліваюцца традыцый, акцэнтуюць увагу на *суне*.

СУНІ́ЦЫ (Fragaria), род кветкавых раслін сям. ружавых. Каля 25 відаў. Пашыраны ў Еўразіі і Амерыцы. На Беларусі 3 віды С.: зялёныя, або палуніцы (F. viridis), трапляюцца пераважна на ПдУ, у далінах рэк, на лугах; лясныя (F. vesca) найб. пашыраны ў лясах, родапачынальнікі сартоў рэмантантных суніц, і больш рэдкія — *клубніцы*. Культывуюцца С. ананасныя, або садовыя (F. ananassa), віргінскія (F. virginiana), клубніцы, а таксама іх гібрыды і сарты.

Шматгадовыя травяністыя расліны. Лісце трайчастае, доўгачаранковае, у прыкараневай разетцы. У пазухах лісця развіваюцца кароткія паўзучыя парасткі (вусы), якія ўкараня-



Суніцы садовыя і іх сарты: 1 — агульны выгляд; 2 — Раннія Махерауха; 3 — Прыгажуня Загор'я; 4 — Фестывальныя; 5 — Рубінавыя.

юцца ў вузлах. Кветкі двухполыя, радзей аднаполыя, белыя, у суквецці шчыток. Плод — несапраўдная ягада, ядомая. Плады маюць у сабе вітаміны, арган. к-ты, пекцінавыя і дубільныя рэчывы. Харч. і лек. расліны.

А.М.Скуратовіч.

СУНІ́ЦЫ МУСКА́ТНЫЯ, або мускусныя, тое, што *клубніцы*.

СУНІ́ЧНАЕ ДРЭ́ВА, сунічнік (Arbutus), род кветкавых раслін сям. верасо-



Сунічнае дрэва чырвонае: парастак з пладамі.

вых. Больш за 20 відаў. Пашыраны ў Паўн. Амерыцы, Міжземнамор'і, Крыме і Зах. Закаўказзі. Тыповы элемент флоры *маквісу*. Культывуюць С.д. чырвонае, або сунічнік драбнаплодны (A. andrachne), і буйнаплодны (A. unedo).

Вечназялёныя кусты і невял. (5—6 м) дрэвы. Лісце буйное, скурыстае, простае, суцэльнае. Кветкі дробныя, белыя або ружаватыя, у верхавінкавых мяцёлках. Плод — ягадападобная шматнасенная касцянка, нагадвае плод суніц (адсюль назва). Плады выкарыстоўваюцца на варэнне і віно, драўніна — на дробныя вырабы, лісце — для дублення скуры. Харч., меданосныя, дэкар. расліны.

В.М.Прохараў.

СУНКУ́ЕЎ Барыс Сямёнавіч (н. 30.8.1938, г. Чыта, Расія), бел. вучоны ў галіне машынабудавання для лёгкай прам-сці. Д-р тэхн. н. (1984), праф. (1985). Скончыў Маскоўскі тэхнал. ін-т лёгкай прам-сці (1960). З 1971 у Віцебскім тэхнал. ун-це (заг. кафедры). Навук. працы па сінтэзе рэгулявальных рычажных механізмаў, даследаванні мех. і дынамічных характарыстык шагавага электрарухавіка. Распрацаваў шэраг тыпаў швейных машын і паўаўтаматаў з мікрапрацэсарным кіраваннем.

Тв.: Расчет пневмогидропривода машин легкой промышленности. Мн., 1988.

В.М.Прохараў.

СУНЛЯ́О, Сунляопін'юань, Маньчжурская раўніна. Размешчана на ПнУ Кітая, у бас. р. Сунгары і Ляахэ. Пл. каля 300 тыс. км². Пераважаюць выш. 200—300 м, на ПдЗ менш за 100 м. Складзена пераважна з рачных і азёрных адкладаў, плоская, слабарасчлянёная. Уздоўж водападзела р. Сунгары і Ляахэ — узгоркі з граніта́ў, гнейсаў і базальтаў, перакрытых лёсам. На З і ПдЗ трапляюцца эолавыя формы рэльефу. Клімат умераны, мусонны, з халоднай зімой і дажджлівым летам. Т-ра студз. на Пн да -22 °С, на Пд да -8 °С, ліп. 20—25 °С. Ападкаў 400—700 мм за год. Стэп на чарназёмах і каштанавых глебах (месцамі саланчакі і пяскі, на Пн участкі шматгадовай мерзлаты). На паўн. і ўсх. ускраіне лесастэп. На Пд і У раўніна густа населена, разарана, на З пашы. Буйныя гарады — Харбін, Чанчунь, Цыцыкар, Шэньян.

СУНХУАЦЗЯ́Н, другая назва р. *Сунгары* на ПнУ Кітая.

СУНЬЦЗЫ́, Сунь У, старажытнакітайскі ваенны тэарэтык і палкаводзец (6—5 ст. да н.э.). У 514—496 да н.э. ваеначальнік царства У, узначальваў паспяховыя паходы супраць царстваў Чу, Цы і Цзінь. Аўтар трактата пра ваен. справу «Суньцзы», у якім выкладзена тэорыя вядзення вайны і ваен. дзеянняў. Вял. значэнне надаваў маральнаму настрою ў войсках і якасцям палкаводца. Трактат паўплываў на развіццё ваен. навукі Кітая, Японіі і Карэі.

Тв.: Рус. пер. — Трактат о военном искусстве // Конрад Н.И. Синология. М., 1995.

СУНЬ ЯТСЕ́Н, Сунь Ісянь, Сунь Вэнь (12.11.1866, павет Чжуншань, Кітай — 12.3.1925), кітайскі рэвалюцыянер і дзярж. дзеяч. Скончыў мед. каледж у Ганконгу (1892). У 1894 заснаваў рэв. арг-цыю *Сінчжунхой*, якая ставіла за мэту скінуць маньчжурскую дынастыю *Цын*. Пасля правалу падрыхтаванага ёй паўстання ў 1895 у эміграцыі. У 1905 на базе Сінчжунхоя С.Я. стварыў больш шырокую рэв. арг-цыю *Тунмэнхой* і сфармуляваў «тры народныя прынцыпы»: нацыяналізм (скіданне маньчжурскай дынастыі і ўсталяванне нац. кіравання), народаўладдзе (рэспубліканскі лад) і нар. дабрабыт (ураўняльнае землекарыстанне). З пач. *Сіньхайскай рэвалюцыі 1911—13* С.Я. вярнуўся ў Кітай, 29.12.1911 абраны часовым прэзідэнтам Кіт. Рэспублікі. У абмен на адрачэнне Цынаў ад улады падаў 13.2.1912 у адстаўку. У канцы 1912 стварыў Нац. партыю (*Гаміньдан*, ГМД). Пасля задушэння летам 1913 паўстання, скіраванага супраць аўтарытарнай палітыкі прэзідэнта Юань Шыкая, С.Я. уцёк у Японію, а ГМД распушчаны. У 1914 С.Я. стварыў у Японіі Кіт. рэв. партыю. З пач. паўстання Паўд. правінцый Кітая супраць пекінскага ўрада (1916) С.Я. вярнуўся ў Кітай. У 1917—18 узначальваў урад у Гуанчжоў, але з-за спрэчак з мясц. ваеннымі выехаў у Шанхай. Распрацаваў там канцэпцыю «паліт. апекі», якая прадугледжвала аб'яднанне Кітая пад кіраўніцтвам рэв. партыі. З гэтай мэтай у 1919 адноўлены ГМД. У 1921 частка дэпутатаў кіт. парламента, распушчанага ваеннымі, абрала С.Я. прэзідэнтам Кіт. Рэспублікі. Аднак яго спробы дамагчыся прызнання з боку сусв. супольніцтва і атрымаць дапамогу ад краін Захаду ў справе аб'яднання Кітая не мелі поспеху. У 1922 ён пагадзіўся на дапамогу СССР у абмен на саюз ГМД з Кітайскай камуністычнай партыяй. У 1923—24 з дапамогай сав. паліт. і ваен. саветнікаў (М.М.*Барадзін*, В.К.*Блюхер* і інш.) ГМД рэарганізавана на ўзор ВКП(б) і створана Нац.-рэв. армія, што забяспечыла перамогу *Рэвалюцыі 1925—28 у Кітаі*.

Тв.: Рус. пер. — Избр. произв. 2 изд. М., 1985.



Сунь Ятсен.

Літ.: Матвеева Г.С. Отец республики: Повесть о Сунь Ятсене. М., 1975; Ефимов Г.В. Сунь Ятсен: Поиск пути, 1914—1922. М., 1981; Тихвинский С.Л. Завещание китайского революционера: Сунь Ятсен: жизнь, борьба и эволюция политич. взглядов. М., 1986; Wilbur C.M. Sun Yat-sen: Frustrated Patriot. New York, 1976.

СУО́НСІ [Swansea; уэльская назва Абертоўі (Abertawe)], горад у Вялікабрытаніі, на Пд Уэльса. Адм. ц. графства Уэст-Гламорган. Каля 200 тыс. ж. (2001). Порт у Брыстольскім зал., вузел чыгунак і аўтадарог. Аэрапорт. Прам-сць: каляровая металургія (цынк, нікель, сплавы), маш.-буд. і эл.-тэхн., металаапрацоўчая, хім., швейная. Каледж Уэльскага ун-та. У мінулым вядомы вырабамі з блакітнай керамікі. У наваколлі нафтаперапр. з-ды.

СУПАДЗЕ́ННЯЎ МЕ́ТАД у ядзернай фізіцы, метад эксперым. даследаванняў, які на аснове выкарыстання *супадзенняў схем* дазваляе ўстанаўліваць часавыя залежнасці розных падзей. Напр., пры вывучэнні элементарных актаў ядз. узаемадзеянняў адным з асн. метадаў вызначэння ўстанаўлення паслядоўнасці з'яўлення другасных часціц і гама-квантаў з'яўляецца рэгістрацыя адначасовасці эл. сігналаў, што паступаюць ад *дэтэктараў ядзерных выпраменняў*. С.м. дазваляе істотна зменшыць уплыў фонавых сігналаў на рэгістрацыю ядз. узаемадзеянняў. С.м. у метралогіі — адзін з метадаў параўнання з мерай, дзе рознасць паміж вымеранай велічынёй і велічынёй, што ўзноўлена мерай, вымяраюць па супадзеннях адзнак на шкалах ці перыяд. сігналаў. Напр., вызначэнне частаты перыяд. працэсу з дапамогай *страбаскапічных прылад*; вымярэнне даўжыні адрэзка штангенцыркулем з ноніусам, якое грунтуецца на супадзенні адзнак на шкалах штангенцыркуля і ноніуса.

СУПАДЗЕ́ННЯЎ СХЕ́МА, пераключальны элемент з некалькімі ўваходамі і адным выхадам, выхадны сігнал якога выяўляецца толькі пры наяўнасці ўсіх уваходных сігналаў. Выконвае аперацыю лагічнага множання (кан'юнкцыю). Вырабляецца на паўправадніковых дыёдах, транзістарах ці інтэгральных схемах. Асн. параметры: раздзяляльны час (найб. часавы зрух паміж уваходнымі сігналамі, пры якім яны ўспрымаюцца як адначасовыя), адчувальнасць, перыяд мёртвага часу (інтэрвал паміж паслядоўнымі спрацоўваннямі С.с.). Выкарыстоўваецца ў выліч. і вымяральнай тэхніцы, аўтаматыцы, радыётэхн. апаратуры, ядз. фізіцы (напр., *супадзенняў метад*) і інш.

СУПАЛІМЕ́РЫ, палімеры, *макрамалекулы* якіх маюць манамерныя звёны розных тыпаў.

Адрозніваюць нерэгулярныя (статыстычныя) і рэгулярныя С., а таксама прышчэпленыя С. — палімеры з разгалінаванымі макрамалекуламі, у якіх асн. ланцуг і адгалінаванні адрозніваюцца саставам і(ці) будовай, і блок-супалімеры — лінейныя С., макрамалекулы якіх пабудаваныя з блокаў, што складаюцца з манамерных звёнаў аднаго або некалькіх тыпаў. У статыст. С. манамерныя звёны (А і В) размешчаны хаатычна, у рэгулярных — размеркаваны з пэўнай паслядоўнасцю; найб. пашыраны чаргавальныя С. (АВАВАВ...). Уласцівасці статыст. (пры сувымернай колькасці звёнаў розных відаў) і чаргавальных С. з'яўляюцца прамежкавымі паміж уласцівасцямі адпаведных гомапалімераў. Прышчэпленыя С. і блок-С. спалучаюць уласцівасці палімераў, што іх складаюць, а часам праяўляюць новыя ўласцівасці, не характэрныя для зыходных кампанентаў (напр., ударатрывалы *АБС-пластык*). Атрымліваюць сінт. С. *суполімерызацыяй* і суполікандэнсацыяй. Выкарыстоўваюць пераважна С. дыенаў з акрыланітрылам (гл. *Бутадыенітрыльныя каўчукі*), стыролам (гл. *Бутадыенстырольныя каўчукі*), ізабутыленам.

СУПА́РСКАЯ СМАЛАКУ́РНАЯ ФА́БРЫКА. Дзейнічала з 1871 ва ўрочышчы Супар каля в. Небытаў Рэчыцкага пав. (цяпер в. Небытаў у Хойніцкім р-не Гомельскай вобл.). Мела 4 паравыя катлы. У 1875 працавала 136 рабочых, выраблена 5,6 тыс. вёдраў смалы, 1,2 тыс. пудоў драўнянага вугалю.

СУ́ПАРТ (англ. і франц. support ад позналац. supporto падтрымліваю), рухомы вузел металарэзных і дрэваапрацоўчых станкоў для замацавання рэзальных інструментаў і перамяшчэння іх адносна загатовак, што апрацоўваюцца. Адрозніваюць С. паводле віду апрацоўкі (такарныя, шліфавальныя і інш.), тыпу разцатрымальніка (разцовыя і рэвальверныя — для замацавання рэвальвернай галоўкі), месцазнаходжання на станку (напр., верхнія, пярэднія) і інш.

СУПАСТАЎЛЯ́ЛЬНАЕ МОВАЗНА́ЎСТВА, гл. *Кантрастыўная лінгвістыка*.

СУПАСТА́ЎНЫЯ ЦЭ́НЫ, цэны, прыведзеныя па велічыні да ўмоў адпаведнага перыяду, на пэўную дату. Выкарыстоўваюцца ў разліках пры супастаўленні аб'ёмаў вытв-сці, тавараабароту, спажывання, даходаў і выдаткаў, інш. вартасных паказчыкаў у пэўныя перыяды, каб пазбегнуць скажэнняў, якія могуць узнікнуць пад уплывам інфляцыі. Напр., пры параўнанні ў грашовым выражэнні ўзроўняў спажывання тых ці інш. тавараў у розныя гады неабходна аб'ём фіз. спажывання памножыць на С.ц. Паказ прадукцыі ў С.ц. забяспечвае супастаўнасць паказчыкаў за шэраг гадоў на прадпрыемстве, у галіне, ва ўсёй эканоміцы, дазваляе ў дынаміцы ацэньваць якасць іх працы.

М.В.Радзіеўскі.



Супадзенняў схема на транзістарах: $R_н$ — агульная нагрузка; R — рэзістары і C — кандэнсатары ў ланцугах зрушэння; T_1—T_n — транзістары.



Супарт такарнага станка: 1 — станіна; 2 — папярочныя санкі (карэтка); 3 — паваротная частка супарта; 4 — разцатрымальнік; 5 — верхнія санкі; 6 — ручка ручной падачы; 7 — ручка папярочнай падачы.

СУПЕР... (ад лац. super зверху, над), першая састаўная частка складаных слоў, якая паказвае на размяшчэнне зверху, над чым-н. (напр., супервокладка); вышэйшую ступень якасці чаго-н., узмацненне дзеяння і пашырэнне магчымасцей (напр., *суперартыкон*, *супермаркет*, суперэліта); старшынство кагон., узначальванне (напр., суперарбітр, суперпрэфект).

СУПЕРАРТЫКО́Н (ад *супер...* + *артыкон*), перадавальная *электронна-прамянёвая трубка* з назапашваннем эл. зараду. Электронны відарыс з фотакатода пераносіцца хуткімі электронамі на двухбаковую мішэнь, дзе ствараецца патэнцыяльны рэльеф, адпаведны размеркаванню асветленасці аб'екта здымкі, счытваецца з другога боку мішэні павольнымі электронамі і атрыманы *відэасігнал* узмацняецца з дапамогай другасна-электроннага памнажальніка. Да 1970-х г. С. — адна з найб. пашыраных перадавальных тэлевізійных трубак. Замяняецца больш дасканалымі разнавіднасцямі *відыкона*, а таксама цвердацельнымі трубкамі з *ПЗС-матрыцамі*.

СУПЕРГЕТЭРАДЗІ́ННЫ РАДЫЁПРЫЁМНІК, найбольш пашыраны тып *радыёпрыёмніка* з пераўтварэннем нясучай частаты прынятых сігналаў (без змены закону мадуляцыі) у больш нізкую фіксаваную (прамежкавую) частату, на якой адбываюцца асн. ўзмацненне і фільтрацыя сігналаў. У параўнанні з радыёпрыёмнікам прамога ўзмацнення вызначаецца большымі адчувальнасцю, селектыўнасцю і каэфіцыентам узмацнення.

Мае прэселектар, пераўтваральнік частаты, *узмацняльнік* прамежкавай частаты, *дэтэктар*, узмацняльнік нізкай частаты і сродкі ўзнаўлення інфармацыі (*гучнагаварыцель*, *кінескоп* і інш.). Прэселектар выконвае папярэднюю селекцыю (гл. *Селектыўнасць радыёпрыёмніка*) карысных сігналаў пры высокай выбіральнасці толькі адносна частаты люстранага канала (адрозніваецца ад частаты карыснага канала на падвоеную прамежкавую) і складаецца з уваходных ланцугоў і ўзмацняльніка радыёчастаты (у дыяпазоне ЗВЧ пры неабходнасці можа дадавацца ўзмацняльнік з малым узроўнем шумаў). Пераўтваральнік частаты мае *гетэрадзін* і змешвальнік, на выхадзе якога ўзнікае вял. колькасць камбінацыйных (сумарных і рознасных) частот карыснага сігналу і гетэрадзіна, з якой узмацняльнік прамежкавай



Блок-схема **супергетэрадзіннага радыёпрыёмніка**: *А* — антэна; *ПЧ* — пераўтваральнік частаты; 1 — уваходныя ланцугі; 2 — узмацняльнік з малым узроўнем шумаў; 3 — узмацняльнік радыёчастаты; 4 — змешвальнік; 5 — гетэрадзін; $f_г$ — частата гетэрадзіна; 6 — узмацняльнік прамежкавай частаты; 7 — дэтэктар; 8 — узмацняльнік нізкай частаты; 9 — сродкі ўзнаўлення інфармацыі.

частаты выдзяляе фіксаваную частату і забяспечвае вял. каэфіцыент узмацнення сігналаў гэтай частаты. Настройка С.р. на прыём пэўнага радыёсігнала дасягаецца адначасовай перастройкай частаты гетэрадзіна і выбіральных ланцугоў прэселектара. У некаторых прафесійных С.р. выкарыстоўваюць 2- ці 3-разовае пераўтварэнне частаты для паляпшэння тэхн. паказчыкаў. С.р. выкарыстоўваецца ў электрасувязі, радыёвяшчанні, тэлебачанні, радыёастраноміі, радыёлакацыі і інш.

А.П.Ткачэнка.

СУПЕРГРАВІТА́ЦЫЯ, лакальнае абагульненне *суперсіметрыі*. Уключае рэлятывісцкія пераўтварэнні каардынат і часу (гл. *Адноснасці тэорыя*) і пераўтварэнні сіметрыі паміж *базонамі* і *ферміёнамі*.

Дазваляе аб'яднаць прасторава-часавыя і ўнутраныя групы сіметрыі і на гэтай падставе апісаць усе вядомыя ўзаемадзеянні (гравітацыйнае, слабае, эл.-магн. і моцнае). С. патрабуе ўвядзення бязмасавай часціцы са спінам $^3/_2$ (гравітына), партнёрам якой па супермультыплету з'яўляецца бязмасавая часціца са спінам 2, якая атаясамліваецца з квантам гравітацыйнага поля — *гравітонам*. Важная перавага С. — значнае скарачэнне ультрафіялетавых разбежнасцей (абарачэнне ў бясконцасць) фіз. велічынь, магчымасць рашыць праблему іерархій і пабудова на яе аснове тэорыі суперструн (аднамерных аб'ектаў у прасторы з 10 ці 26 вымярэннямі) — каліброванай тэорыі вышэйшай сіметрыі, якая дазваляе апісаць усе элементарныя часціцы і іх узаемадзеянні на адзінай аснове.

Літ.: Фридман Д., Ньювенхейзен П. ван. Супергравитация и унификация законов физики: Пер. с англ. // Успехи физ. наук. 1979. Т. 128, вып. 1; Окунь Л.Б. Физика элементарных частиц. 2 изд. М., 1988.

В.І.Куўшынаў.

СУПЕРМА́РКЕТ (англ. supermarket), буйны магазін самаабслугоўвання для продажу тавараў паўсядзённага попыту (пераважна харчовых). С. ўзніклі ў ЗША у 1930, пашырыліся з 2-й пал. 1940-х г. Могуць уваходзіць у склад сеткі магазінаў. Буйныя сеткі С. здольны атрымліваць значную эканомію ад маштабаў рэалізацыі і на групавой аснове з атрыманнем выгадных скідак і ўступак ад вытворцаў пры аптовай закупцы, і на ўзроўні асобных магазінаў за кошт выкарыстання капіталаёмкіх метадаў рознічнага гандлю. У Рэспубліцы Беларусь С. звычайна называюць *універсамамі*.

СУПЕРМЭ́Н (ад *супер...* + англ. man чалавек), 1) у іранічным значэнні — чалавек, упэўнены ў сваёй перавазе над іншымі; звышчалавек. 2) Герой дэтэктываў, кінабаевікоў, коміксаў і пад., надзелены надзвычайнымі якасцямі, якія робяць яго непераможным.

СУПЕРПАЗІ́ЦЫІ ПРЫ́НЦЫП, прынцып накладання, 1) у класічнай фізіцы — тэарэтычнае дапушчэнне, паводле якога вынік некалькіх незалежных адначасовых уздзеянняў на пэўны фіз. аб'ект з'яўляецца сумай эфектаў, выкліканых кожным уздзеяннем паасобку. Напр., напружанасць $\vec{E}$ эл. поля сістэмы зарадаў (q_1, q_2, ..., q_n) у выбраным пункце назірання роўная вектарнай суме напружанасцей эл. палёў ($\vec{E}_1$, $\vec{E}_2$, ..., $\vec{E}_n$), створаных кожным зарадам незалежна: $\vec{E} = \vec{E}_1 + \vec{E}_2 + ... + \vec{E}_n$. Выконваецца для сістэм, якія апісваюцца лінейнымі ўраўненнямі, і адыгрывае важную ролю ў механіцы, электрадынаміцы, тэорыі палёў і вагальных працэсаў. 2) У квантавай механіцы С.п. адносіцца да *хвалевых функцый* і сцвярджае: калі фіз. сістэма можа знаходзіцца ў станах, якія характарызуюцца дзвюма (або некалькімі) хвалевымі функцыямі, то яна таксама можа знаходзіцца ў стане, які характарызуецца лінейнай камбінацыяй гэтых функцый (прынцып суперпазіцыі станаў).

СУПЕРСІМЕТРЫ́Я, Фермі—Бозе сіметрыя, сіметрыя, што звязвае палі, кванты якіх маюць цэлалікавы спін (*базоны*), з палямі, кванты якіх маюць паўцэлы спін (*ферміёны*). Палі, што пераўтвараюцца пры пераўтварэннях С. адно праз другое, утвараюць супермультыплеты, якія аб'ядноўваюць у адну сям'ю часціцы з рознай статыстыкай — базоны і ферміёны.

Адно з найб. важных дастасаванняў С. — суперсіметрычнае абагульненне каліброванай палявой тэорыі фундаментальных узаемадзеянняў — *супергравітацыя*. Яна мае пераўтварэнні С. з параметрамі, залежнымі ад каардынат (лакальныя пераўтварэнні С.). *Інварыянтнасць* адносна лакальных пераўтварэнняў С. патрабуе існавання партнёраў па супермультыплету, якія маюць спіны, што адрозніваюцца адзін ад аднаго на $^1/_2$ (эксперыментальна не выяўлены; 2002). Напр., прадказваюцца слептон, скварк, фатына, глюіна, як суперпартнёры адпаведных элементарных часціц: *лептонаў*, *кваркаў*, *фатонаў* і *глюонаў*.

А.А.Богуш.

СУПЕРСТРА́Т, гл. ў арт. *Стратыфікацыя моў*.

СУПЕРФАСФА́Т, фосфарнае ўгнаенне, дзе фосфар утрымліваецца ў монакальцыйфасфаце і свабоднай фосфарнай к-це. Атрымліваюць з апатытавага канцэнтрату ці з прыродных фасфатаў (апатытаў, фасфарытаў). Вырабляюць С. просты, грануляваны, падвойны, аманізаваны, марганізаваны, борны, малібдэнавы. Выкарыстоўваюць на глебах усіх тыпаў у якасці асн., перадпасяўнога ўгнаення, таксама для падкормак. Найб. эфектыўны на шчолачных і нейтральных глебах. Пры ўнясенні ў кіслыя глебы С. змешваюць з фасфарытнай мукой ці перагноем, каб папярэдзіць пераўтварэнне фосфарнай к-ты ў цяжказасваяльныя раслінамі фасфаты алюмінію і жалеза.

СУ́ПЕР-ЭВМ, клас звышпрадукцыйных *электронных вылічальных машын* для рашэння складаных задач. Па сваіх магчымасцях параўноўваецца з мозгам чалавека.

Звышвысокая прадукцыйнасць дасягаецца ў асн. за кошт паралельнай архітэктуры: выкарыстання вял. колькасці універсальных і спецыялізаваных *працэсараў*, паралельнага *праграмавання*, хуткадзейных звышвялікіх *інтэгральных схем*. Шматпрацэсарная машына функцыянуе пад кіраўніцтвам адзінай *аперацыйнай сістэмы*. Хуткадзеянне залежыць ад раўнамернасці загрузкі працэсараў, арганізацыі схемы разлікаў (*праграмнага забеспячэння*). С.-ЭВМ выкарыстоўваецца для навук. мадэліравання, апрацоўкі вынікаў даследаванняў, фінансавай (напр., банкаўскай) інфармацыі, кіравання чыгункай ці інш. трансп. сістэмай, прагнозу надвор'я, праектавання лятальна-касм. апаратаў, ядз. і хім. рэактараў, рашэння задач газа- і гідрадынамікі, цепла- і масаабмену, энергетыкі, генетыкі чалавека, распазнавання вобразаў і інш.

На Беларусі і ў Расіі паводле праграмы «СКІФ» (галаўныя арг-цыі НДА «Кібернетыка» Нац. АН Беларусі і Ін-т праграмных сістэм Рас. АН) распрацавана С.-ЭВМ з хуткадзеяннем 20 млрд. аперацый з плавальнай коскай за секунду, дзе рэалізавана паралельная архітэктура і шэраг арыгінальных рашэнняў у апаратным і праграмным забеспячэнні, што дае магчымасць павышэння хуткадзеяння да трыльёнаў аперацый за секунду.

М.П.Савік.

СУ́ПЕСАК, рыхлая асадкавая пясчана-гліністая горная парода. Мае пясчаных да 70%, гліністых (памерам менш за 0,01 мм) да 10% і пылаватых (памерам 0,01—0,05 мм) часцінак да 20%. Бываюць ледавіковыя (марэнныя), водна-ледавіковыя, азёрныя, рачныя (алювіяльныя) і інш. Адрозніваюць С. груба-, дробнапясчаныя і пылаватыя. Больш гліністыя С. наз. цяжкімі, менш гліністыя — лёгкімі.

СУПІ́Н (лац. supinum), аддзеяслоўны назоўнік са значэннем мэты дзеяння пры дзеясловах руху. Ужываўся ў лац. і слав. мовах у функцыях, блізкіх да сучаснага *інфінітыва*. Напр., лац. venio rogatum «прыходжу прасіць», стараслав. идѫ ловитъ «іду лавіць». У раманскіх мовах, што ўзніклі з лацінскай, С. не захаваўся. У слав. мовах сустракаецца ў ніжнялужыцкай і славенскай (напр., славенскае grem se sprehajat «іду гуляць»).

А.Я.Міхневіч.

СУПЛЕТЫВІ́ЗМ (ад позналац. suppletivus дадатковы), утварэнне форм аднаго і таго ж слова ад розных каранёў. Напр., «чалавек — людзі» (формы ліку), «узяць — браць» (формы трывання дзеяслова), «добры — лепшы» (формы ступеняў параўнання прыметнікаў), «многа — болей» (формы ступеняў параўнання прыслоўяў), «я — мне, яны — іх» (склонавыя формы займеннікаў), «ёсць — быў» (формы часу дзеяслова). С. уласцівы словам, якія адрозніваюцца ад інш. высокай частотнасцю ўжывання.

А.Я.Міхневіч.

СУПЛО́ДДЗЕ, сукупнасць спелых пладоў аднаго *суквецця*, якое адасоблена ад вегетатыўнай ч. парастка. У менш спецыялізаваных С. свабодныя плады сядзяць на адасобленых пладаножках (бузіна, вінаград, рабіна, парасонавыя), у больш спецыялізаваных С. складаецца з сухіх свабодных аднанасенных пладоў, абкружаных абгорткай (складанаквет-

ныя) або ў сакавітым ёмішчы (інжыр). Пры далейшай спецыялізацыі зрастаюцца голыя плады (ліквідамбар, пандануc) або іх калякветнікі — сакавітыя (шаўкоўніца) ці сухія (бурак). Вельмі буйныя С. ананаса, хлебнага дрэва, маклюры ўтвараюцца ад зрастання пладоў з сакавітай воссю і інш. элементамі суквецця.

СУПОЛІМЕРЫЗА́ЦЫЯ, сумесная *полімерызацыя* некалькіх (2 і больш) манамераў; прамысл. метад вытв-сці многіх сінт. *супалімераў*.

Рэакцыйная здольнасць (актыўнасць) манамераў пры С. вызначаецца іх прасторавай будовай, спалучэннем і палярнасцю падвойных сувязей. Састаў супалімера звычайна (акрамя выпадкаў азеатропнай С., калі актыўнасці манамераў аднолькавыя) адрозніваецца ад саставу манамернай сумесі, які ў ходзе працэсу мяняецца: колькасць больш актыўнага манамера памяншаецца, менш актыўнага — павялічваецца. Пры С. да глыбокіх ступеняў ператварэння манамераў рознай актыўнасці валавы супалімер мае ланцугі рознага саставу. Размяшчэнне звёнаў у ланцугах статыстычнае, акрамя выпадкаў чаргавальнай, ці альтэрнатыўнай С., калі незалежна ад саставу сумесі манамераў утвараюцца супалімеры з рэгулярным чаргаваннем звёнаў. С. дазваляе накіравана змяняць уласцівасці палімераў. Выкарыстоўваюць С. для атрымання палімераў з разнастайнымі ўласцівасцямі.

СУПО́ЛЬНАСЦЬ, сукупнасць індывідаў, аб'яднаных гістарычна складзенымі ўстойлівымі сац. сувязямі і адносінамі, наяўнасцю агульных рыс, якія надаюць ёй пэўную адметнасць. У адрозненне ад арг-цыі і ін-таў, што ствараюцца людзьмі свядома, С. узнікае пад уплывам аб'ектыўных прычын (характар гаспадаркі і ладу жыцця, падзел працы, спосаб вытв-сці і інш.). Кожная С. мае свае адметныя, уласцівыя толькі ёй рысы і захоўвае іх на працягу свайго існавання. Гістарычна першымі відамі С. былі *сям'я*, *род*, *племя*, *абшчына*. Яны ўзніклі на аснове кроўнароднаснага адзінства, сумеснай вытв. дзейнасці, агульных этнічных прыкмет. З пераходам ад першабытнаабшчыннага ладу да новых больш складаных форм грамадскай арг-цыі пашырыліся крытэрыі С. і найперш за кошт агульнасці тэрыторыі і мовы, у выніку чаго ўзніклі *народнасці*, пазней *нацыі*. Нац. С. на працягу доўгага часу адыгрывае ролю гал. суб'екта грамадскіх адносін. Ёсць і інш. віды С., што ствараюцца на розных уласцівых ім аб'ектыўных асновах. У якасці сац. С. можна разглядаць працоўныя калектывы, прафес. групы і інш. элементы сац. структуры грамадства. *В.І.Боўш.*

СУПО́ЛЬНІЦТВА (La Communauté), Французскае Супольніцтва, палітычнае і эканам. аб'яднанне Францыі, яе ўладанняў і шэрагу незалежных дзяржаў — б. франц. калоній. Створана ў 1958 па ініцыятыве Францыі ўзамен Франц. Саюза (дзейнічаў з 1946). У кампетэнцыю С. ўваходзяць знешняя палітыка, абарона, фін. сістэма, выкарыстанне стратэг. сыравіны, а таксама назіранне за органамі юстыцыі, вышэйшай адукацыяй, знешнім транспартам і сродкамі сувязі. Кіраўнік С. — прэзідэнт Францыі. На 2001 у С., акрамя Францыі, уваходзілі яе 4 заморскія дэпартаменты, 6 заморскіх тэрытарый і 12 незалежных дзяржаў.

СУ́ПРАСЛЬ (Supraśl), горад на ПнУ Польшчы, у Падляскім ваяв., на р. Супрасль. Каля 5 тыс. ж. (2000). Прам-сць: дрэваапр., тэкст., керамічная. Турызм. Адзін з цэнтраў бел. культуры ў Польшчы. Узнікненне С. звязана з перанясеннем у 1500 *Супрасльскага Дабравешчанскага манастыра* з г. Гарадок у сярэдняе цячэнне р. Супрасль на месца будучага горада. У манастыры зберагалася каштоўная *Супрасльскага Дабравешчанскага манастыра бібліятэка* (з яе паходзяць *Супрасльскі летапіс* і інш. рукапісы, гл. *Супрасльскі рукапіс*). У манастыры была збудавана *Супрасльская царква-крэпасць*, у канцы 17 — пач. 19 ст. дзейнічала *Супрасльская друкарня*. З 16 ст. С. — мястэчка Гродзенскага пав. Трокскага ваяв. ВКЛ. Пасля 3-га падзелу Рэчы Паспалітай (1795) С. у складзе Прусіі, быў сядзібай уніяцкага мітрапаліта. Пасля *Тыльзіцкага міру 1807* С. у складзе Рас. імперыі, мястэчка ў Беластоцкім пав. Беластоцкай вобл., з 1843 — Гродзенскай губ. У 1834 г. у С. адкрыта 1-я суконная мануфактура. У 1867 — 2800 ж., 450 дамоў, касцёл, евангелічная кірха, сінагога, 5 суконных ф-к. У 1915—18 акупіраваны герм. войскамі. З 1919 у Беластоцкім ваяв. Польшчы. З вер. 1939 у БССР, гар. пасёлак у Беластоцкім пав., з 15.1.1940 у Беластоцкім р-не. З 20.9.1944 у складзе Польшчы.

СУ́ПРАСЛЬСКАГА ДАБРАВЕ́ШЧАНСКАГА МАНАСТЫРА́ БІБЛІЯТЭ́КА. Існавала ў 16—19 ст. пры *Супрасльскім Дабравешчанскім манастыры* (цяпер Падляскае ваяв., Польшча) і была адной з буйнейшых бібліятэк ВКЛ. Паводле вопісу 1557 архімандрыта Сергія Кімбара, у яе фондах было 209 кніг, у т.л. «книг битых» (друкаваных) — 7; паводле вопісу 1645 — каля 600 кніг, сярод якіх пераважалі друкаваныя на лац. (212 т.) і польскай (152 т.) мовах. Большасць з іх была куплена ў Гданьску, Варшаве, Тыкоціне. Кірыліцкіх кніг было больш за 200. Сярод друкаваных кніг зберагаліся выданні Ф.Скарыны (кн. «Іоў», «Псалтыр», 1517, і «Апостал», 1525), В.Цяпінскага (унікальны экзэмпляр Евангелля), І.Фёдарава і інш. Паводле вопісу 1688 колькасць лац. і польскіх кніг зменшылася адпаведна да 104 і 72. Зберагаліся халдзейская граматыка, грэч. кнігі (Евангелле, Новы запавет, граматыка). У 17 ст. Супрасль быў адным з найбуйнейшых цэнтраў кірыліцкай кніжнасці ўсх.-слав. зямель. Тут зберагаліся *Супрасльскі рукапіс* 11 ст., летапісны зборнік 1-й пал. 16 ст., зборнік 1519 з самым поўным спісам 2-й рэдакцыі *Беларуска-літоўскага летапісу 1446*, кірыліцкі рукапіс нотна-лінейнага пісьма — Супрасльскі Ірмалагіён 1598—1601. Сярод кірыліцкіх кніг былі і напісаныя на пергаменце. У 18 ст. б-ка значна папоўнілася пераважна за кошт лаціна- і польскамоўных кніг, у т.л. надрукаваных у *Супрасльскай друкарні*. Вопіс 1764 фіксуе 1456 кніг, у т.л. больш за 800 на лац. мове, больш за 300 на польскай, больш за 100 рукапісных і друкаваных царкоўнаслав. кніг. Паводле вопісу 1836, у б-цы 1862 кнігі, у т.л. 1100 на стараж. мовах (пераважна на лац.), больш за 50 на франц., больш за 20 на ням., больш за 100 на італьян., каля 400 кніг на польск. мове. Акрамя асноўнай, у манастыры былі і келейныя б-кі. У 1876 кнігі (1109 экз.) і каля 200 спраў манастырскага архіва перададзены ў Віленскую публічную б-ку. Значная частка Супрасльскага кнігазбору, найбольш старажытная і каштоўная, на гэты момант ужо была вывезена рознымі асобамі. З 1880-х г. б-ка і архіў сталі паступова папаўняцца дзякуючы ігумену манастыра архімандрыту Мікалаю (Далматаву). Большая частка рукапісаў і друкаваных кніг б-кі знаходзіцца ў Вільнюсе, пэўная колькасць — у С.-Пецярбургу, Маскве, Варшаве і інш.

Літ.: Добрянский Ф. Описание рукописей Виленской публичной библиотеки, церковно-славянских и русских. Вильна, 1882; Улащик Н.Н. Введение в изучение белорусско-литовского летописания. М., 1985; Лабынцев Ю.А. Издания Франциска Скорины и др. славянских первопечатников в библиотеке Супрасльского монастыря // Белорусский просветитель Франциск Скорина и начало книгопечатания в Белоруссии и Литве. М., 1979; Яго ж. Пачатае Скарынам. Мн., 1990. *Ю.А.Лабынцаў.*

СУ́ПРАСЛЬСКАЯ ДРУКА́РНЯ. Існавала з пач. 1690-х г. да 1803 пры *Супрасльскім Дабравешчанскім манастыры* (цяпер у Польшчы). Створана на аснове Свята-Троіцкай віленскай базыльянскай друкарні. Размяшчалася ў мураваным будынку манастыра. Выпусціла больш за 420 выданняў. Зарэгістравана больш за 100 кірылічных выданняў, у т.л. буквары слав. мовы, «Собрание припадков краткое» (1722) на старабел. мове, першы славяна-польскі друкаваны «Лексікон» (1722), першы кірылічны помнік нотадрукавання (1697, у зб. «Паследаванне пострыгу»). У 18 ст. выпускала таксама стараверскія выданні. З сярэдзіны 18 ст. пад уплывам ідэі асветніцтва павялічыўся выхад перакладной навук. і маст. л-ры, арыгінальных твораў мясц. аўтараў. На польскай мове выдадзены «Прыгоды Гулівера» Дж.Свіфта (1784), «Авантуры філосафаў, якія пакахалі модных жанчын» (1789), «Кароткі збор польскай гісторыі і геаграфіі» (1767), «Асновы земляробства», «Нясвіжская ардынацыя», «Трактат пра пчол», «Людвіг XVI, забіты сваім народам», «Дыялог бурмістра з войтам» і інш. У 1780—90-я г. выпусціла некалькі кніг на літ. мове. Друкарня мела манапольнае права выпускаць некат. выданні для уніяцкай царквы, што прыносіла

значныя даходы. Была добра абсталявана, выкарыстоўвала разнастайныя шрыфты, маст. ўпрыгожанні, наборны арнамент, фігурныя дрэварыты і гравюры на медзі.

Літ.: Лабынцев Ю.А. В помощь составителям сводного каталога старопечатных изданий кирилловского и глаголического шрифтов: Метод. указ. Вып. 3. Кирилловские издания Супрасльской типографии. М., 1978; Яго ж. Графіка беларускіх выданняў Супрасля // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1983. № 2; Шматаў В.Ф. Беларуская кніжная гравюра XVI—XVIII стст. Мн., 1984.

Г.Я.Галенчанка.



Супрасльская царква-крэпасць. З малюнка В.Гразнова. 2-я пал. 19 ст.

СУ́ПРАСЛЬСКАЯ ЦАРКВА́-КРЭ́ПАСЦЬ, помнік архітэктуры 1-й пал. 16 ст. ў г. Супрасль (Польшча). Пабудавана ў 1503—11 (паводле інш. звестак у 1509—10) па фундацыі маршалка ВКЛ А.І.Хадкевіча і мітрапаліта кіеўскага І.Солтана як гал. храм *Супрасльскага Дабравешчанскага манастыра*. У 18 ст. перабудавана. Мела рысы стыляў позняй готыкі, рэнесансу і ракако. Прамавугольны ў плане 4-вежавы 3-нефавы 6-стаўповы абарончы храм зальнага тыпу з трыма гранёнымі апсідамі. Крыжова-цэнтрычная кампазіцыя завяршалася барочным купалам складанай канфігурацыі на 8-гранным светлавым барабане. Такія ж завяршэнні мелі 4 вуглавыя вежы. Фасады падзяляліся на 3 ярусы: ніжні цокальны, аздоблены цаглянай муроўкай з трэльяжным арнаментам; сярэдні, аддзелены ад ніжняга аркатурным поясам, меў стральчатыя аконныя праёмы і люкарны ў ліштвах, завершаны машыкульным фрызам; верхні ярус — 4-франтонны складанай формы з высокімі арачнымі аконнымі праёмамі, аркатурай і інш. элементамі аздобы. Уваход быў вырашаны ў выглядзе прамавугольнага ў плане прытвора пад 2-схільным дахам, які меў байніцы і машыкулі. Цэнтр. неф быў значна шырэйшы за бакавыя. Нефы непасрэдна пераходзілі ў апсіды. У сярэдзіне 18 ст. інтэр'ер набыў ракайлевае дэкар. ўбранне: крывалінейныя ў плане хоры з ажурнай агароджай, сцены расчлянёны ляпнымі панэлямі і пілястрамі, арачныя праёмы афармлены трэльяжнай сеткай, ляпной арнаментыкай з S- і С-падобных завіткоў. Ракайлевую трактоўку набылі гал. і кулісныя алтары. У 1557 храм размаляваны фрэскамі (маст. «сербин Нектарий» і інш.), іканаграфія якіх набліжаецца да мастацтва Візантыі канца 14 — пач. 15 ст. з элементамі зах.-еўрапейскага. У 1944 ням.-фаш. захопнікі пры адступленні ўзарвалі царкву (захавалася часткова). Захаваліся рэшткі фрэсак (30 фрагментаў на слупах, якія рэстаўраваны ў 1964—66 і захоўваюцца ў Беластоцкім музеі). У 1999 адбудавана.

Літ.: Шчакаціхін М. Нарысы з гісторыі беларускага мастацтва. Т. 1. Мн., 1993 [рэпр. выд.: Мн., 1928]; Чантурия В.А. История архитектуры Белоруссии. Т. 1. 3 изд. Мн., 1985; Ткачоў М.А. Замкі Беларусі (XIII—XVII ст.). Мн., 1977; Рогов А.И. Фрески Супрасля // Древнерусское искусство: Монументальная живопись XI—XVII вв. М., 1980; Церашчатава В.В. Старажытнабеларускі манументальны жывапіс XI—XVIII стст. Мн., 1986.

А.М.Кулагін, Ю.А.Якімовіч, В.В.Церашчатава.

СУ́ПРАСЛЬСКІ ДАБРАВЕ́ШЧАНСКІ МАНАСТЫ́Р, праваслаўны мужчынскі манастыр у г. Супрасль (Польшча). Засн. ў 1498 навагрудскім ваяводам і маршалкам ВКЛ А.І.Хадкевічам пры ўдзеле архіепіскапа смаленскага Іосіфа ў родавай сядзібе *Хадкевічаў* у Гарадкуна-Супраслі, у 1500 перанесены ва ўрочышча Сухі Груд. У 1501 пабудавана царква Іаана Багаслова (згарэла ў 1650). У 1503 архіепіскап Іосіф перадаў манастыру Супрасльскі абраз Маці Божай і ахвяраваў яму ў 1506 зямельную маёмасць у Бельскім пав. У 1510 пабудавана *Супрасльская царква-крэпасць* у імя Дабравешчання Прасвятое Багародзіцы, у 1511 асвячона. Манастыру дадзены статут, і ён стаў адным з буйнейшых цэнтраў бел. правасл. культуры, у ім фарміраваліся багаслоўска-філасофская, іканаграфічная і арх. школы, склаўся своеасаблівы стыль царк. спеваў (супрасльскі распеў). Тут напісаны «Пасланне каталіцкаму іерарху пра ерась каталіцызму» (1511), *Супрасльскі летапіс*, «Валынскі летапіс», «Кіева-Пячэрскі пацярык» (усе 1519), дзейнічалі залатарская, пераплётная і інш. майстэрні. У 1537 пабудавана царква Уваскрэсення Хрыстова. У *Супрасльскага Дабравешчанскага манастыра бібліятэцы* захоўваліся сотні каштоўных рукапісных і старадрукаваных кніг. Манахі на чале з архімандрытам Іларыёнам (кн. Масальскі) змагаліся супраць Брэсцкай уніі 1596. Аднак пры архімандрыце Герасіме Веліконцію (1609—35) манастыр стаў уніяцкім і падпарадкаваны ордэну *базыльян* (з 1722 у манастыры знаходзілася гал. рэзідэнцыя гэтага ордэна). У 1645—1853 (з перапынкамі) пры манастыры дзейнічала духоўнае вучылішча, у 1695—1803 — *Супрасльская друкарня*, у 1710—1834 — паперня. У 1645—52 пабудаваны палац архімандрытаў, у 1695—97 — мураваная званіца. Астатнія надворныя будынкі (манаскія келлі, гасп. пабудовы) узведзены ў 2-й пал. 18 ст.



Супрасльскі Дабравешчанскі манастыр. Палац архімандрытаў. 17 ст.



Комплекс **Супрасльскага Дабравешчанскага манастыра**.

У выніку 3-га падзелу Рэчы Паспалітай (1795) манастыр знаходзіўся на тэрыторыі, якая адышла да Прусіі, пасля Тыльзіцкага міру (1807) — да Расіі. Уніяцкія манахі фінансава падтрымалі паўстанне 1794, удзельнічалі ў паўстанні 1830—31. У 1-й трэці 19 ст. манастыр заняпаў. У 1842 маёмасць манастыра канфіскавана. У 1875 на старых манастырскіх могілках пабудавана царква св. Панцеляймона, у 1890 — цёплая царква Іаана Багаслова, у 1901 — царква Георгія Пераможцы на новых могілках. У 1925 значная частка маёмасці манастыра аддадзена ў арэнду каталіцкаму ордэну салезіянаў. У 1944 ням. фашысты ўзарвалі Дабравешчанскую царкву і спалілі манастырскія будынкі разам з б-кай. У 1958 вернікі адбудавалі царкву Іаана Багаслова. У 1984 дзяржава вярнула вернікам руіны Дабравешчанскай царквы. У 1996 польскі ўрад замацаваў за правасл. царквой увесь манастырскі комплекс. У 1999 завершана праца па адбудове Дабравешчанскай царквы, вядуцца работы па аднаўленні інтэр'ера. *М.Ю.Гайдук.*

СУ́ПРАСЛЬСКІ ЛЕ́ТАПІС, помнік беларуска-літоўскага летапісання 15 ст., самы поўны спіс 2-й рэдакцыі *Беларуска-літоўскага летапісу 1446*. Захаваўся ў рукапісе 1519, выяўленым М.К.*Баброўскім* у пач. 19 ст. ў б-цы *Супрасльскага Дабравешчанскага манастыра* (адсюль назва, гл. таксама *Супрасльскі рукапіс*). Складаецца з 2 асн. частак: 1-я — «Избрание летописания», куды ўваходзяць скарочаны стараж.-рус. летапіс (ахоплівае гісторыю Русі за 854—1427), *Смаленская хроніка*, «*Пахвала Вітаўту*» і смаленскія пагадовыя запісы за 1432—46; 2-я — «*Летапісец вялікіх князёў літоўскіх*» з «*Аповесцю пра Падолле*». Тэкст «Летапісца...» няпоўны, з прапускамі. Упершыню апублікаваны І.М.*Даніловічам* у 1823—24 у час. «*Дзеннік Віленьскі*». Змешчаны таксама ў 17-м і 35-м т. *Поўнага збору рускіх летапісаў*. Зберагаецца ў Архіве Санкт-Пецярбургскага філіяла Ін-та рас. гісторыі Рас. АН.

В.А.Чамярыцкі.

СУ́ПРАСЛЬСКІ РУ́КАПІС, назва розных рукапісных зборнікаў — помнікаў усх.-слав. пісьменства. Да 19 ст. зберагаліся ў б-цы *Супрасльскага Дабравешчанскага манастыра* (адсюль назва). Найб. вядомыя і каштоўныя: Зборнік жыцій і пропаведзяў 11 ст. Напісаны старославян. мовай на пергаменце (285 лістоў). Месца ўзнікнення дакладна невядома. Мяркуюць, што рукапіс балг. паходжання. Уяўляе сабой чэцыю-мінею (кнігу для чытання) на сакавік. Змяшчае 24 жыціі і 24 словы-павучанні, у т.л. 20 слоў Іаана Златавуста. Разам з *Тураўскім евангеллем* і інш. рукапісамі 11 ст. гэты зборнік — адзін з самых стараж. помнікаў усх.-слав. пісьменства. Адкрыў і даследаваў М.К.*Баброўскі*. У 19 ст. падзелены на 3 часткі, якія зберагаюцца ў Варшаве (151 ліст), Любляне (118 лістоў) і С.-Пецярбургу ў Рас. нац. б-цы (16 лістоў). У зарубежнай навук. л-ры гэты зборнік называюць Супрасльскім кодэксам (Codex Suprasliensis). Летапісны зборнік 1-й пал. 16 ст. Складаецца з рус. скарочанага летапісу, блізкага да *Аўрамкі летапісу*, кароткай летапіснай выбаркі па гісторыі Русі і ВКЛ пачынаючы з 862 і гіст. запісаў пра падзеі канца 15 — пач. 16 ст. на Беларусі, у Кіеве і на Валыні (гл. *Валынскі кароткі летапіс*). Упершыню апубл. ў 1836 М.Я.Абаленскім. Зберагаецца ў Маскве ў Рас. дзярж. архіве стараж. актаў. Зборнік 1519 змяшчае свецкія і рэлігт. творы, у т.л. самы поўны спіс 2-й рэдакцыі *Беларуска-літоўскага летапісу 1446* (гл. *Супрасльскі летапіс*), пераклад на бел. мову Вісліцкага статута польск. караля Казіміра III Вялікага, «*Кіева-Пячэрскі пацярык*» і інш. Перапісаны ва ўсх. Беларусі пісцом Рыгорам для кн. С.Адынцэвіча, радаслоўе якога змешчана ў канцы рукапісу. Адкрыты Баброўскім. Зберагаецца ў архіве С.-Пецярбургскага філіяла Ін-та рас. гісторыі Рас. АН.

Літ.: Супрасльская рукопись, содержащая Новгородскую и Киевскую сокращенныя летописи. М., 1836; Бобровский П.О. Судьба Супрасльской рукописи, открытой... М.К.Бобровским. СПб., 1887; Северьянов С. Супрасльская рукопись. Т. 1. СПб., 1904; Супрасълски или Ретков сборник. Т. 1—2. София, 1982—83. *А.В.Чамярыцкі.*

СУПРАЦЎЛЕ́ННЕ МАТЭРЫЯ́ЛАЎ, навука, якая вывучае паводзіны розных матэрыялаў пад дзеяннем прыкладзеных нагрузак; вызначае трываласць, жорсткасць і ўстойлівасць дэталей машын, элементаў канструкцый і збудаванняў. Грунтуецца на законах і вывадах *тэарэтычнай механікі*, тэорыях паўзучасці, пластычнасці і пругкасці (гл. адпаведныя арт.), у эксперым. частцы выкарыстоўвае палажэнні *матэрыялазнаўства*.

Асн. задачы С.м. — падбор матэрыялу і вызначэнне памераў канструкцыйных элементаў, якія забяспечваюць патрэбную эксплуатацыйную надзейнасць і даўгавечнасць тэхн. аб'ектаў. Гал. разліковымі характарыстыкамі з'яўляюцца *дэфармацыі* і *напружанні механічныя*, колькасныя характарыстыкі якіх у пэўным пункце залежаць ад прынятай формы элемента, лікавага значэння і спосабу прыкладання знешняй нагрузкі. З дапамогай С.м. робяць інж. разлік бэлек, стрыжняў, валоў, пліт, абалонак, арак і інш. Заснавальнікам С.м. лічыцца Г.*Галілей*. Асн. закон С.м. (*Гука закон*) адкрыты Р.*Гукам*. Значны ўклад у С.м. зрабілі рас. вучоныя Л.*Эйлер*, Дз.І.Жураўскі, М.М.Бяляеў, В.З.Уласаў, Ю.М.Работнаў і інш., франц. інж. і вучоны Л.М.А.*Наўе*, а таксама бел. вучоныя Я.Ф.*Вінакураў*, Я.М.*Макушок*, І.А.*Прусаў*, Г.К.*Татур* і інш.

Літ.: Тимошенко С.П. История науки о сопротивлении материалов: Пер. с англ. М., 1957; Татур Г.К. Курс сопротивления материалов. Ч. 1—3. Мн., 1962—66; Беляев Н.М. Сопротивление материалов. 15 изд. М., 1976; Справочник по сопротивлению материалов. Мн., 1988. *І.І.Леановіч.*

СУПРАЦЎЛЕ́ННЕ ЭЛЕКТРЫ́ЧНАЕ, гл. *Электрычнае супраціўленне*.

СУПРАЦЬПАВЕ́ТРАНАЙ АБА́РОНЫ ВО́ЙСКІ, гл. ў арт. *Войскі проціпаветранай абароны*, *Процівоздушная абарона*.

СУПРУ́Н Адам Яўгенавіч (24.10.1928, г. Палтава, Украіна — 18.8.1999), бел. мовазнавец. Д-р філал. н. (1966), д-р пед. н. (1982), праф. (1967). Скончыў Кіргізскі ун-т (1952) і працаваў у ім у 1952—66. З 1966 у БДУ (заг. кафедры). Даследаваў пытанні тэарэт. і прыкладной лінгвістыкі, граматыку, лексіку і гісторыю слав. моў, методыку выкладання рус. мовы ў нац. школах. С. — спецыяліст па палабскай мове: «Палабскія лічэбнікі» (1962), «Лексічная спалучальнасць у палабскай мове» (1973), «Асноўныя праблемы палабскай семасіялогіі» (1978), «Палабская мова» (1987). Сааўтар «Асноў тэорыі моўнай дзейнасці» (1974), «Частотнага слоўніка беларускай



А.Я.Супрун.

мовы» (з Н.С.Мажэйка; вып. 1—5, 1976—92), «Этымалагічнага слоўніка беларускай мовы» (т. 1, 3, 1978, 1985), «Агульнага мовазнаўства» (1983) і інш.

Тв.: Славянские числительные. Мн., 1969; Русский язык советской эпохи. Л., 1969; Части речи в русском языке. М., 1971; Лекции по языкознанию. Мн., 1971; Лингвистические основы изучения грамматики русского языка в белорусской школе. Мн., 1974; Лекции по языковедению. Мн., 1978; Лекции по лингвистике. Мн., 1980; Содержание обучения русскому языку в белорусской школе. Мн., 1987; Введение в славянскую филологию. 2 изд. Мн., 1989; Старославянский язык. Мн., 1991; Праславянский язык. Мн., 1993.

Літ.: Библиографический указатель по славянскому и общему языкознанию: Профессор А.Е.Супрун. Самарканд, 1984.

СУПРУ́Н Васіль Рыгоравіч (н. 10.3.1926, в. Глоўсевічы Слонімскага р-на Гродзенскай вобл.), бел. краязнавец, археолаг, пісьменнік. Вучыўся ў Слонімскай настаўніцкай семінарыі, скончыў Мінскі пед. ін-т (1969). Настаўнічаў. У 1947 рэпрэсіраваны. Пакаранне адбываў у Інце і Варкуце. Вярнуўся на Беларусь у 1956. 25 гадоў працаваў на будаўніцтве. Друкуецца з 1943. У вершах патрыят. пафас, роздум над няпростым часам: зб-кі «Крык» (1993), «Рэха абуджаных дзён» (1994), «Незабыўныя ксівы» (1997), «Жыць для Беларусі» (1998). Як археолаг у 1963—69 вёў даследаванні ў Брэсцкай і Гродзенскай абласцях. Кн. «За смугою часу» (1994), «Дзеі над Шчарай» (2000) прысвечаны археал. помнікам і гісторыі Слонімшчыны.

І.У.Саламевіч.

СУПРУ́Н Сцяпан Паўлавіч (2.8.1907, с. Рэчкі Белапольскага р-на Сумскай вобл., Украіна — 4.7.1941), удзельнік баёў на Беларусі ў Вял. Айч. вайну; першы ў час вайны двойчы Герой Сав. Са-

юза (1940, 1941). Скончыў Ваен. школу пілотаў (1931). У Чырв. Арміі з 1929. З 1931 лётчык-выпрабавальнік. Удзельнік баёў з яп. захопнікамі (у 1939—40 камандаваў групай добраахвотнікаў лётчыкаў-знішчальнікаў у Кітаі), сав.-фінл. вайны 1939—40. У Вял. Айч. вайну з 1941 на Зах. фронце. Камандзір знішчальнага авіяц. палка асобага прызначэння (сфарміраваны з лётчыкаў-выпрабавальнікаў). У першым баі С. збіў 2 самалёты праціўніка. 4 ліп., выконваючы чацвёрты за дзень вылет, С. уступіў у бой з 6 фаш. знішчальнікамі. Загінуў каля в. Манастыры (цяпер в. Палявая) Талачынскага р-на. На месцы яго гібелі ўстаноўлены помнік.



С.П.**Супрун**.



Дз.А.**Супруненка**.

СУПРУНЕ́НКА Дзмітрый Аляксеевіч (8.11.1915, г. Майкоп, Адыгея — 1.8.1990), бел. матэматык. Акад. АН Беларусі (1966, чл.-кар. 1959). Д-р фіз.-матэм. н., праф. (1956). Засл. дз. нав. Беларусі (1975). Скончыў Растоўскі ун-т (1938). З 1945 у БДУ (з 1947 заг. кафедры, адначасова з 1957 дэкан ф-та). З 1963 у Ін-це матэматыкі АН Беларусі (у 1963—87 заг. лабараторыі). Навук. працы па лінейных групах, камутатыўных матрычных алгебрах, матэм. кібернетыцы. Развіў тэорыю лінейных вырашальных і нільпатэнтных груп. Распрацаваў эфектыўныя метады рашэння задач дыскрэтнай аптымізацыі. Прапанаваў падыход да рашэння некаторых задач тэорыі раскладаў, якія маюць шматлікія дастасаванні. Дзярж. прэмія Беларусі 1974.

Тв.: Разрешимые и нильпотентные линейные группы. Мн., 1958; Перестановочные матрицы. Мн., 1966 (разам з Р.І.Тышкевіч); Группы матриц. Мн., 1972; Группы подстановок. Мн., 1996.

Літ.: Д.А.Супруненко // Весці АН БССР. Сер. фіз.-мат. навук. 1990. № 6.

СУПРУНЕ́НКА Ірына Дзмітрыеўна (н. 4.2.1954, Мінск), бел. матэматык. Д-р фіз.-матэм. н. (1997). Дачка Дз.А.*Супруненкі* і Р.І.*Тышкевіч*. Скончыла БДУ (1976). З 1976 у Ін-це матэматыкі Нац. АН Беларусі. Навук. працы па алгебры. Распрацавала метады даследавання ўласцівасцей уніпатэнтных элементаў у мадулярных прадстаўленнях алг. груп і распазнавання прадстаўленняў на гэтай аснове. Вызначыла мінім. паліномы уніпатэнтных элементаў у непрыводных прадстаўленнях класічных алг. груп над полем няцотнай характарыстыкі. Даследавала абмежаванні прадстаўленняў алг. груп на натуральна ўкладзеныя падгрупы.

Тв.: Минимальные полиномы элементов порядка p в неприводимых представлениях групп Шевалле над полями характеристики p // Вопросы алгебры и логики: Труды Ин-та математики СО РАН. Новосибирск, 1996. Т. 30; On Jordan blocks of elements of order p in irreducible representations of classical groups with p-large highest weights // Journal of algebra. 1997. Vol. 191, № 2. *М.П.Савік*.

СУПРУНЧУ́К Віктар Пятровіч (н. 7.12.1949, в. Сялец Бярозаўскага р-на Брэсцкай вобл.), бел. пісьменнік. Скончыў БДУ (1976). З 1977 працаваў у «Сельской газете», з 1981 на Бел. тэлебачанні, з 1983 у час. «Полымя». У 1990—98 нам. старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі. З 1998 нам. гал. рэдактара час. «Всемирная литература», з 1999 гал. рэдактар час. «Корвет». З 2001 нач. управаўлення інфармацыі Беларусбанка. Друкуецца з 1977. Аўтар апавяданняў, аповесцей «Трэці сын» (1983), «Сяргей Сяргеевіч» (1985) на тэмы сучаснага жыцця. Раман «Жывеш толькі раз» (1988) пра вясковыя праблемы. Аповесць «Банальны дэтэктыў» (1989), раман «З крыві і плоці» (1990) пра няпростую працу міліцыі. Распрацоўвае маральна-этычныя і сац. праблемы.

Тв.: Страсці. Мн., 1983; Недзе баліць ля сэрца. Мн., 1986; З плоці і крыві: Аповесць, раман, апавяданні. Мн., 1991; Баю-бай, мой генерал. Мн., 1997. *І.У.Саламевіч*.

СУПРЭМАТЫ́ЗМ (ад лац. supremus найвышэйшы), кірунак у авангардысцкім мастацтве сярэдзіны 1910—20-х г.; від геам. абстракцыі (гл. *Абстракцыянізм*). Засн. ў 1913 К.С.*Малевічам*. Тэорыя С., якая сцвярджала вяршэнства абстрактнай формы, зведзенай да квадрата, круга, трохвугольніка, прамавугольніка, крыжа, была выкладзена ў маніфесце Малевіча «Ад кубізму і футурызму да супрэматызму» (1916). Першыя свае супрэматычныя карціны Малевіч паказаў у 1915 на выстаўцы «0,10» у Петраградзе. Для С. характэрна падкрэсленая сімволіка колеру. Камбінацыі рознакаляровых плоскасцей увасабляліабсалютныя, «вышэйшыя» пачаткі рэчаіснасці, спасцігнутыя інтуіцыяй мастака. У рэчышчы С. працавалі І.Клюн, І.Пуні, Эль Лісіцкі, М.Суэцін. С. увасобіўся ў жывапісе, графіцы, сцэнаграфіі, дэкар.-прыкладным мастацтве і інш., значна паўплываў на *канструктывізм*.

Літ.: Шунейка Я. Супрэмус, або Творца беспрадметнага мастацтва // Мастацтва Беларусі. 1989. № 2; Наков А. Русский авангард: Пер. с фр. М., 1991; Сарабьянов Д.В., Шатских А.С. Казимир Малевич: Живопись. Теория. М., 1993. *Я.Ф.Шунейка*.



Да арт. **Супрэматызм**. К.Малевіч. Супрэматычная кампазіцыя. 1916.



Да арт. **Супрэматызм**. М.Суэцін. Кубак і сподак з супрэматычнай размалёўкай. 1923.

СУПЯРЭ́ЧНАСЦІ ЗАКО́Н, закон несупярэчнасці, прынцып адмаўлення супярэчнасці, асноўны лагічны закон, згодна з якім пэўнае меркаванне і яго адмаўленне не могуць адначасова быць сапраўднымі. Сімвалічна запісваецца ў выглядзе формулы A&Ā, дзе A — пэўнае меркаванне, Ā — адмаўленне A, & — знак кан'юнкцыі, рыса над усёй формулай — яе адмаўленне. Упершыню С.з. сфармуляваны Арыстоцелем; сучасную фармулёўку набыў у працах Г.Лейбніца. Закон не закранае супярэчнасцей аб'ектыўнай рэчаіснасці (гл. *Супярэчнасць дыялектычная*), але выключае лагічныя *супярэчнасці* ў доказах, тэорыях і навуках. Тэорыі, для якіх С.з. справядлівы, з'яўляюцца несупярэчлівымі; у процілеглых выпадках тэорыі наз. супярэчлівымі, г.зн. непрымальнымі. Гл. таксама *Несупярэчлівасць*.

СУПЯРЭ́ЧНАСЦЬ, 1) цэнтральная катэгорыя *дыялектыкі*, якая выяўляе ўнутраную крыніцу *самаруху* і *развіцця* аб'ектыўнага свету і пазнання (гл. *Супярэчнасць дыялектычная*). 2) Лагічная памылка, звязаная з парушэннем *супярэчнасці закону*, якая выяўляецца ў дапушчэнні ў розумазаключэнні 2 меркаванняў, што супярэчаць адно аднаму.

Адрозніваюць С. п р а м ы я, калі прадмету прыпісваецца прыкмета, якая з'яўляецца прамым адмаўленнем інш. прыкметы гэтага прадмета (напр., «круглы стол прамавугольны»), і н е п р а м ы я, калі няяўную С. можна зрабіць яўнай шляхам лагічнага аналізу. Атрыманая ў выніку пэўнага меркавання ці доказу С. сведчыць пра памылковасць *пасылак*. Выяўленая ў пэўнай тэорыі С. абясцэньвае гэтую тэорыю і пакладзеныя ў яе аснову прынцыпы (аксіёмы, пастулаты), сведчыць пра іх непрымальнасць.

СУПЯРЭ́ЧНАСЦЬ ДЫЯЛЕКТЫ́ЧНАЯ, узаемадзеянне супрацьлеглых бакоў і тэндэнцый, якія знаходзяцца ў стане ўнутранага адзінства, узаемапранікнення і складаюць крыніцу *самаруху* і *развіцця* аб'ектыўнага свету, а таксама працэсу пазнання. С.д. займае цэнтр. месца ў *дыялектыцы*, у прыватнасці ў *дыялектычным матэрыялізме*, і характарызуе змест закону *адзінства і барацьбы процілегласцяў*. Прызнанне С.д. у якасці ўнутр. зместу ўсіх прадметаў і з'яў, асн. перадумовай іх руху і развіцця адрозніваe дыялектыку ад метафізікі, дзе крыніцай руху лічыцца знешняе ўздзеянне. Завершаны цыкл развіцця С.д. уключае некалькі этапаў: адрозненне, палярызацыя, сутыкненне, антаганізм; адзінства супрацьлеглых бакоў пераходзіць у іх барацьбу, а ў канчатковым выніку — да вырашэння С.д. Развіццё С.д. акрэслівае паслядоўныя этапы ў развіцці прадмета ці з'явы, якое прыводзіць да іх пераходу ў новую якасць з новымі, пакуль скрытымі С.д. Існуюць разнастайныя формы С.д.: унутр. і вонкавыя, істотныя і неістотныя, антаганістычныя і неантаганістычныя. Працэс пазнання адбываецца праз пошук, вывучэнне і вырашэнне С.д., што суправаджаецца С.д. у развіцці думкі: барацьбой ідэй, тэорый і навук. школ. С.д. нельга атаясамліваць з т.зв. «лагічнай» *супярэчнасцю*, якая характарызуе непаслядоўнасць мыслення. *В.І.Боўш.*

СУПЯСЧА́НЫЯ ГЛЕ́БЫ, глебы, якія маюць 10—20% часцінак фіз. гліны. Развіваюцца на водна-ледавіковых, уласна ледавіковых, супясчаных лёсападобных і алювіяльных адкладах. Адрозніваюць С.п. пылаватыя і пясчаныя. Характарызуюцца высокай водапранікальнасцю, хуткай стратай вільгаці і элементаў жыўлення, глыбістасцю, утварэннем паверхневай скарынкі, павышанай кіслотнасцю, завалуненасцю. Патрабуюць аптымізацыі воднага рэжыму, водна-фіз. і фіз.-хім. уласцівасцей. На Беларусі найб. пашыраны тып глеб.

СУР, горад на Пд Лівана. Засн. ў 4-м тыс. да н.э. (стараж. фінікійская назва *Тыр*). Каля 20 тыс. ж. (2001). Порт на Міжземным м., чыг. ст., вузел аўтадарог. Пераважае саматужна-рамесніцкая вытв-сць вырабаў з шоўку і шкла. Археал. музей. Рэшткі стараж. і сярэдневяковых пабудоў, мазаікі рым., візант. і арабскага часу. Турызм.

СУРАБА́Я (Surabaya), горад у Інданезіі, на в-ве Ява. Адм. ц. правінцыі Усх. Ява. Вядомы з пачатку н.э. 2461 тыс. ж. (2000). Марскі порт, вузел аўтадарог, паромная сувязь з в-вам Мадура. Міжнар. аэрапорт. Другі пасля г. Джакарта прамысл. цэнтр краіны. Прам-сць: металаапр., маш.-буд. (суднаверфі, аўтазборачны з-д, эл.-тэхн. прадпрыемствы), нафтаперапр., хім., харчасмакавая, тэкст., гарбарна-абутковая, дрэваапр., цэм., лёгкая. Маст. промыслы (выраб тканіны батык, разьба па дрэве і інш.). Ун-т. Музей. Каля С. база інданез. ВМФ.

СУРАГА́Т (ад лац. surrogatus пастаўлены замест іншага), 1) заменнік натуральнага прадмета, прадукту, які мае некат. яго ўласцівасці. Напр., С. натуральнай кавы — ячмень, жалуды. 2) Падробка; падроблены, фальсіфікаваны прадукт.

СУ́РАЖ, гарадскі пасёлак у Віцебскім р-не, на р. Зах. Дзвіна пры ўпадзенні ў яе р. Каспля, на аўтадарозе Віцебск—Веліж (Расія). За 43 км на ПнУ ад Віцебска. 1,2 тыс. ж. (2001).

Вядомы з 16 ст. У 1563 пабудаваны *Суражскі замак*. 20.12.1569 С. атрымаў герб: у сярэбраным полі мур з трыма вежамі. З 1590 цэнтр староства. У вайну Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—67 захоплены (2.9.1656) рус. войскамі, вернуты ВКЛ паводле *Андросаўскага перамір'я 1667*. З 1772 у Рас. імперыі, з 1777 горад, цэнтр павета, з 1796 у Беларускай губ. У 1780 у С. 300 ж., больш за 100 дамоў, драўляная царква. З 1802 у Віцебскай губ. У 1830-я г. пабудаваны Спаса-Праабражэнская і Петрапаўлаўская цэрквы, у 1864 заснавана нар. вучылішча. З 1866 заштатны горад *Віцебскага павета*. У 1897 у С. 2731 ж., прыстань, 2-класнае павятовае і нар. вучылішчы; у пач. 20 ст. 4400 ж., 11 мураваных і каля 440 драўляных дамоў, 48 рамесных майстэрняў, 69 крам, сплаў лесу, 2 царквы. У 1924—60 цэнтр *Суражскага раёна* Віцебскай акр., з 1938 у Віцебскай вобл., з 27.9.1938 гар. пасёлак, 3000 ж. У Вял. Айч. вайну з 12.7.1941 да 28.10.1943 акупіраваны ням. фашыстамі, якія ў С. і раёне загубілі 9181 чал. 12.9.1941 партыз. атрад пад камандаваннем М.П.*Шмырова* разграміў у С. варожы гарнізон. Са студз.—сак. 1942 да снеж. 1943 існавала *Суражская партызанская зона*. На ПнУ ад С. знаходзіліся т.зв. Суражскія, ці *Віцебскія «вароты»*. У 1960—62 і з 1965 у Віцебскім (у 1962—65 у Лёзненскім) р-не.

Працуюць лясгас, сярэдняя і муз. школы, сад-яслі, Дом культуры, цэнтр дзіцячай творчасці, б-ка, аптэка, аддз. сувязі. Помнік дзецям Героя Сав. Саюза Шмырова. Археал. помнік — замчышча. *В.В.Віталёва.*

СУ́РАЖСКАЕ МО́РА, С у д а к с к а е м о р а, адна са стараж. назваў Азоўскага м. (часам разам з Чорным) ад г. Судак (Сугдзея, Салдая, стараж.-рус. форма Сураж). Назва Судакскае м. (араб. Бахр-Судак) выкарыстоўвалася мусульманскімі географамі 14—15 ст. У рус. гіст. крыніцах С.м. ўпершыню ўпамінаецца пад 1319.

СУ́РАЖСКАЯ НІЗІ́НА. На ПнУ Беларусі ў Віцебскай вобл., частка на тэр. Смаленскай вобл. (Расія). Фізіка-геагр. раён *Беларуска-Валдайскай правінцыі* (акруга Бел. Паазер'я). Мяжуе з Гарадоцкім узв. на З і Віцебскім узв. — на Пд. Выш. 150—160 м. Пл. каля 900 км^2.

Прымеркавана да *Аршанскай упадзіны*. У асадкавай тоўшчы вылучаны магутныя (да 1500 м і болей) адклады верхняга дакембрыю (пяскі, пясчанікі, алеўрыты, гліны), дэвонска-каменнавугальнага (да 200 м; вапнякі, даламіты, мергелі, гліны) і юрска-антрапагенавага (да 190 м; мел, мергелі, пяскі, супескі, гліны) комплексаў. Фарміраванне паверхні С.н. звязана з акумуляцыйнай і абразійнай дзейнасцю Суражскага прыледавіковага вадаёма, які існаваў у браслаўскі стадыял *паазерскага зледзянення*. Пазней вадаём быў спушчаны ракой Зах. Дзвіна каля г. Віцебск. Нізіна запоўнена азёрна-ледавіковымі глінамі і алеўрытамі, на ўскраінах пашыраны флювіягляцыяльныя адклады (жвір, пяскі, супескі), у асобных месцах марэнныя суглінкі. Карысныя выкапні: лёгкаплаўкія гліны, даламіт, буд. пяскі, пясчана-жвіровы матэрыял, торф.

Паверхня пласкахвалістая з эолавымі ўзгоркамі і парабалічнымі дзюнамі, лагчынамі, азёрнымі катлавінамі. Аднос-



Да арт. **Супрэматызм**. Эль Лісіцкі. Пра 2 квадраты. Супрэматычная казка ў шасці карцінках. 1920.

ныя перавышэнні рэльефу 2—3 м, да 10 м (дзюнны рэльеф). Нізіну дрэніруюць р. Зах. Дзвіна з прытокамі Каспля, Усвяча з Аўсянкай. Даліны маюць па 2—3 эразійна-акумулятыўныя тэрасы. Найб. азёры Вымна, Цёста, Сясіта. Сярэдняя т-ра студз. -7,8 °С, ліп. 18 °С. Ападкаў 620 мм за год. Глебы пераважна дзярнова-падзолістыя, дзярнова-глеістыя і тарфяна-балотныя. Пад лесам каля 30%, лясы хваёвыя, асінавыя, бярозавыя, чорнаальховыя, трапляюцца дамешкі ясеню, клёну, ліпы і інш. Балоты вярховага тыпу. Пад ворывам да 20%. У межах С.н. біял. заказнік *Запольскі*.

СУ́РАЖСКАЯ ПАПЯРО́ВА-КАРДО́ННАЯ ФА́БРЫКА. Дзейнічала ў 1890—1925 у г. Сураж Віцебскага пав. (цяпер гарадскі пасёлак у Віцебскім р-не). Выпускала белы, буры, жоўты кардон, абгортачную паперу і драўняную масу. Працавала больш за 50 рабочых.

СУ́РАЖСКАЯ ПАРТЫЗА́НСКАЯ ЗО́НА ў Вялікую Айчынную вайну, тэрыторыя на ПнУ Віцебскай вобл., якую ў час акупацыі ням. фашыстамі кантралявалі партызаны з 1942 да снеж. 1943. Складвалася на працягу студз.—сак. 1942 у ходзе наступальных дзеянняў партыз. атрадаў, у т.л. М.П.*Шмырова*, з дапамогай часцей Чырв. Арміі Калінінскага фронту. Да лета 1942 межы зоны ахапілі Суражскі (акрамя райцэнтра), часткі Гарадоцкага, Віцебскага, Лёзненскага, Механаўскага р-наў (пл. 3 тыс. км^2). Абаранялі зону партыз. брыгады 1-я Бел., імя А.Ф.Данукалава, 2-я Бел. імя П.К.Панамарэнкі, імя М.Кутузава, 1-я Віцебская, імя Чырванасцяжнага Ленінскага камсамола Віцебскай вобл. і некат. інш. партыз. фарміраванні. Агульнае кіраўніцтва баявой і гасп. дзейнасцю ў зоне ажыццяўлялі спец. штаб на чале з І.Ф.Бердзіянам, Суражскі, Віцебскі, Гарадоцкі, Лёзненскі, Механаўскі падп. райкомы КП(б)Б, адноўленыя сав. сельсаветы з удзелам Віцебскага падп. абкома КП(б)Б, Паўн.-Зах. аператыўнай групы ЦК КП(б)Б, камандавання Калінінскага і 1-га Прыбалт. франтоў. У канцы вер. 1942, калі гітлераўцы ліквідавалі *Віцебскія «вароты»*, тэрыторыя зоны звузілася. На працягу года з чэрв. 1942 акупанты правялі супраць партызан 11 карных аперацый («Серабрыстая ліса», «Белы мядзведзь», «*Шаравая маланка*», «*Грамавы ўдар*», «*Майская навальніца*», «Веснавы карагод», «Дождж на сёмуху» і інш.). Са снеж. 1943 пасля *Гарадоцкай аперацыі 1943* пачалося вызваленне ад акупацыі тэрыторыі зоны, большасць партыз. фарміраванняў злучаліся з Чырв. Арміяй. Утрыманне С.п.з. ў 1942 мела стратэгічнае значэнне для развіцця партыз. руху на Беларусі і ў суседніх Калінінскай вобл. Расіі, Латвіі, Літве. Больш як паўгода партызаны зоны ўтрымлівалі Віцебскія «вароты», выратавалі жыццё дзесяткаў тысяч жанчын, дзяцей, старых. Актыўнай баявой дзейнасцю партызаны дэзарганізоўвалі тыл ворага на стыку груп ням. армій «Поўнач» і «Цэнтр», актыўна ўзаемадзейнічалі з Чырв. Арміяй.

Літ.: Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941—1945: Энцыкл. Мн., 1990. С. 582.

У.С.Пасэ.

СУ́РАЖСКІ Васіль, бел. і ўкр. пісьменнік-палеміст 2-й пал. 16 ст. Мяркуючы па прозвішчы, паходзіў з Суража, але невядома з якога — віцебскага, бранскага ці падляшскага. Пасля смерці І.Фёдарава кіраваў да 1598 Астрожскай друкарняй. Да асобных яе выданняў напісаў прадмовы. Быў членам літ. гуртка кн. К.Астрожскага. У гісторыю палемічнай л-ры ўвайшоў як аўтар кн. «Аб адзінай ісціннай праваслаўнай веры і святой саборнай апостальскай царкве» (Астрог, 1588), скіраванай супраць прапаганды ідэі царкоўнай уніі Б.Гербеста і П.Скаргі. У творы выявіў эрудыцыю ў веданні царк.-кананічнай л-ры. Цікавая зместам і некат. запазычаннямі ў інш. аўтараў кніга С. не вызначаецца літ. густам. Свае думкі ён выклаў на царк.-слав. мове і толькі зрэдку ўстаўляў словы жывой нар. мовы, таму стыль надзвычай цяжкі.

Літ.: Памятники полемической литературы в Западной Руси. Кн. 2. СПб., 1882; Возняк М. Історія української літератури. Т. 2, ч. 1. Львів, 1921; Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры. Т. 1. Мн., 1968; История белорусской дооктябрьской литературы. Мн., 1977.

А.Ф.Коршунаў.

СУ́РАЖСКІ ЗА́МАК. Існаваў у 16—18 ст. у г. *Сураж* Віцебскага пав. (цяпер гар. пасёлак у Віцебскім р-не). Пабудаваны з дрэва ў сутоках рэк Каспля і Зах. Дзвіна ў 1563 паводле загаду вял. кн. ВКЛ і караля Рэчы Паспалітай Жыгімонта II Аўгуста. У ходзе ваен. падзей 17—18 ст. замак зведаў неаднаразовыя разбурэнні; у 1616 і 1633 спалены рас. войскамі, але праз некат. час зноў адноўлены. У вайну Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—67 С.з. здадзены 2.9.1656 царскаму войску. На «Чертеже» (1701), зробленым стольнікам Пятра I М.Цызыровым, зафіксаваны абарончыя сцены С.з. без вежаў і 2 масты цераз роў; замак паказаны ў плане як круглы. Пасля 1772 С.з. перастаў існаваць.

СУ́РАЖСКІ ПАВЕ́Т, адм.-тэр. адзінка Рас. імперыі ў 1777—96 і 1802—66. Цэнтр — г.п. *Сураж*. Утвораны 22.3.1777 у складзе Полацкай губ. Скасаваны 12.12.1796, адноўлены 27.2.1802 у складзе Віцебскай губ. Пл. каля 3,2 тыс. км^2, насельніцтва больш за 36 тыс. чал. (1863). Канчаткова скасаваны ў 1866, тэр. падзелена паміж Віцебскім, Веліжскім і Гарадоцкім пав. *В.Л.Насевіч.*

СУ́РАЖСКІ РАЁН, адм.-тэр. адзінка ў БССР у 1924—60. Цэнтр — г.п. *Сураж*, з 1957 — г.п. *Янавічы*. Утвораны 17.7.1924 у складзе *Віцебскай акругі*, 28.8.1924 падзяляўся на 12 сельсаветаў. З 1938 у Віцебскай вобл. 20.1.1960 раён скасаваны, тэрыторыя перададзена Гарадоцкаму, Езярышчанскаму і Віцебскаму р-нам.

В.Л.Насевіч.

СУ́РАЖСКІ ШКЛОЗАВО́Д. Дзейнічаў у 1861—96 у г. Сураж Віцебскага пав. (цяпер гарадскі пасёлак у Віцебскім р-не). У 1886—96 працавала ад 32 да 69 рабочых.

СУ́РАЖСКІЯ «ВАРО́ТЫ», тое, што *Віцебскія «вароты»*.

СУРАКА́РТА (Surakarta), Сола, горад у Інданезіі, у цэнтр. ч. в-ва Ява. Уваходзіць у правінцыю Цэнтр. Ява. Засн. ў 18 ст. Каля 550 тыс. ж. (2001). Вузел чыгунак і аўтадарог. Аэрапорт. Прам-сць тэкст. і харчовая. Традыц. маст. промыслы (выраб тканіны батык і інш.). Музеі: гіст., старадаўняй яванскай культуры ў палацы Сола. Мячэць Мангкунегаран (16 ст.), 2 палацы султана (18 ст.), галандскі форт (1779).

СУРА́Т, горад на З Індыі, у штаце Гуджарат. Вядомы з сярэдневякоўя. У 1613 тут засн. першая англ. гандл. факторыя ў Індыі. Каля 2 млн. ж. з прыгарадамі (2001). Порт на Аравійскім м., у вусці р. Тапты. Вузел чыгунак і аўтадарог. Аэрапорт. Прам-сць: тэкст., харч., папяровая. Рамесная вытв-сць тканін, карункаў з залатымі і сярэбранымі ніткамі, парчы; разьба па дрэве. Ун-т.

СУ́РАЎ, рака ў Клімавіцкім і Касцюковіцкім р-нах Магілёўскай вобл., правы прыток р. Беседзь (бас. р. Дняпро). У верхнім цячэнні наз. Сураўка. Даўж. 49 км. Пл. вадазбору 215 км^2. Пачынаецца на паўн. ускраіне в. Завідаўка Клімавіцкага р-на, вусце ў в. Фёдараўка Касцюковіцкага р-на. Цячэ па паўд.-ўсх. ч. Аршанска-Магілёўскай раўніны. Даліна выразная, пераважна трапецападобная,



Аўтар В.Л.Насевіч

шыр. 0,5—1 км, месцамі да 1,5 км. Рэчышча звілістае, свабодна меандруе, ад вытоку на працягу 8,4 км каналізаванае.

СУРАЎНІ́, вёска ў Шумілінскім р-не Віцебскай вобл. Цэнтр Казьянскага с/с і саўгаса. За 28 км на Пн ад гар. пас. і чыг. ст. Шуміліна, 65 км ад Віцебска. 256 ж., 91 двор (2002). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

СУРБАРА́Н (Zurbarán) Франсіска дэ (хрышчаны 7.11.1598, г. Фуэнтэ-дэ-Кантас, Іспанія — 27.8.1664), іспанскі жывапісец. Вучыўся ў Севільі у П.Д.дэ Вільянуэвы. Працаваў пераважна ў Льерэне, Севільі, Мадрыдзе. Зазнаў уплыў М.*Караваджа*. Творы вылучаюцца грубаватай рэалістычнасцю вобразаў, павышанай дэталізацыяй, частым увядзеннем у карціны элементаў нацюрморта. Раннім работам уласціва выкарыстанне шырокіх форм і аб'ёмаў («Укрыжаванне», 1627). У перыяд творчага росквіту (1630—40-я г.) стварыў суровыя манументальна-лаканічныя, драматычна-напружаныя і адначасова стрыманыя ў выяўленні пачуццяў вобразы. Творы адметныя смелай абагульненасцю і матэрыяльнасцю пластычнай мадэліроўкі, строгай гамай шэрых і карычневых, насычаных чырвоных тонаў: «Трыумф святога Фамы Аквінскага» (1631), «Спакушэнне святога Іераніма» (1634), «Святы Францыск», цыкл карцін для картэзіянскага кляштара Ла Картуха ў Херэс-дэ-ла-Франтэра (1637—39) і інш. Для твораў 1650—60-х г. характэрны рысы лірычнай сузіральнасці і эмацыянальнай усхваляванасці: «Бічаванне Хрыста», «Мадонна з дзіцем і Іаанам Хрысціцелем». У 1640-я г. стварыў серыі карцін, прысвечаных жыццю кляштара ордэна іеранімітаў у Гуадалупе: «Спакушэнне брата Дыега Арзаскага», «З'яўленне Хрыста брату Андрэсу Сальмерону», «Уяўленне брата Педра-Саламанкскага»; партрэты (серыя «Дактары з Ла Мерсед», «Доктар з Саламанкі» і інш.).

Літ.: Малицкая К.М. Ф.Сурбаран. М., 1963. *С.У.Пешын.*

СУРВІ́ЛА (Шыманец-Сурвіла) Івонка (н. 11.4.1936, г. Стоўбцы Мінскай вобл.), бел. мовазнавец, мастак, грамадска-паліт. дзеяч у эміграцыі. Дачка бел. мастака У.Шыманца. З 1944 за мяжой (жыла ў Данії, Францыі, Іспаніі, цяпер у Канадзе). Скончыла ў Парыжы Вышэйшую маст. школу, потым моўнае аддзяленне Сарбоны (1959). У 1958—65 на Нац. ісп. радыё ў Мадрыдзе, вяла на бел. мове радыёперадачы, якія транслiраваліся на Беларусь. У 1969—97 перакладчыца (англ. і франц. мовы) ва ўрадзе Канады. Удзельнічала ў маст. выстаўках як жывапісец. У 1989 заснавала Канадскі фонд дапамогі ахвярам Чарнобыля на Беларусі, яго прэзідэнт да 1997; фонд аказваў гуманіт. дапамогу пацярпелым ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС, арганізоўваў лячэнне і аздараўленне ў Канадзе бел. дзяцей. З 1997 старшыня *Рады Беларускай Народнай Рэспублікі*. *Л.У.Языковіч.*



Ф.**Сурбаран**. Святы Францыск.

СУРВІ́ЛА Паўліна (н. 1961, Мадрыд), амерыканскі этнамузыколаг і мастачка бел. паходжання. Д-р у галіне музыказнаўства, прафесар. Дачка І.*Сурвілы*. Жыла ў Іспаніі, Францыі, з канца 1960-х г. у Канадзе, цяпер у ЗША. Служыла музыкантам у канадскім войску. Скончыла ун-т у ЗША (штат Мічыган; 1992). Выкладае ва ун-це Паўн. Караліны. Даследуе бел. музыку Мінска, Палесся, Беласточчыны і інш. мясцін. Займаецца жывапісам (найб. значная маст. выстаўка ў 1996 у штаце Агайо, ЗША), малюе на бел. сюжэты. Аўтар шэрагу публікацый у амер. друку пра бел. традыц. і рок-музыку. *А.С.Ляднёва, Г.Г.Сяргеева.*

СУРВІ́ЛІШСКАЕ ВО́ЗЕРА, другая назва воз. *Вялікае Сурвілішскае*.

СУРВІ́ЛІШСЦКІ ТРО́ІЦКІ КАСЦЁЛ, помнік архітэктуры барока ў в. Сурвілішкі Іўеўскага р-на Гродзенскай вобл. Пабудаваны ў 2-й пал. 18 ст. з дрэва на месцы касцёла 1550, фундаванага Р.Гайкоўскай і яе братамі Іванам і Антонам. Храм крыжападобны ў плане, уключае 1-нефавы прамавугольны асн. аб'ём, вузкі трансепт і 5-гранную апсіду, да якой прылягаюць нізкія сакрыстыі. Асн. аб'ём і апсіда аб'яднаны агульным 2-схільным дахам з вальмай над алтарнай часткай. Сцены фасадаў маюць лучковыя і круглыя аконныя праёмы ў простых ліштвах і завершаны шырокім карнізам па перыметры асн. аб'ёму, трансепта і апсіды. Гал. фасад расчлянёны 2 тонкімі пілястрамі на 3 часткі, завершаны фігурным франтонам. У інтэр'еры арган, афармлены ў стылі барока. У трансепце захаваліся 2 барочныя алтары, афармленыя калонамі і пілястрамі карынфскага ордэра, разным расл. арнаментам, галоўкамі пуцці. У 1878—80 да касцёла прыбудавана званіца (захаваўся яе цагляны фундамент). Храм абкружаны бутавай агароджай з 2-яруснай мураванай брамай. *С.Г.Багласаў.*

СУРВЭ́ТКА, узорысты тканы, вязаны, плецены, гафтаваны, вышыты выраб з лёну, бавоўны, шоўку для ўпрыгожвання жылога інтэр'ера. Форма С. разнастайная: прамавугольнік, квадрат, круг, многавугольнік, эліпс і інш. На Беларусі пашырана з 19 ст. Традыц. бел. С. белыя, аздобленыя пераважна чырвонай вышыўкай; у вязаных найчасцей утвараецца геам. арнамент.



Сурвілішскі Троіцкі касцёл.

СУРГА́НАЎ Фёдар Анісімавіч (7.6.1911, в. Суднікі Віцебскага р-на — 26.12.1976), дзяржаўны і парт. дзеяч Беларусі, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў падполля і партыз. руху на Беларусі ў Вял. Айч. вайну. Скончыў Бел. с.-г. ін-т (1939). У 1931—34 аграном у сістэме Наркамзема БССР. З 1939 на камсам. рабоце, у 1942—45 сакратар ЦК ЛКСМБ. У 1942—43 у складзе аператыўнай групы ЦК КП(б)Б і БШПР на Калінінскім фронце. У жн. 1943 — ліп. 1944 у тыле ворага: упаўнаважаны ЦК КП(б)Б і ЦШПР, адзін з кіраўнікоў партыз. руху і падполля на тэр. Вілейскай, Баранавіцкай і Беластоцкай абл. З 1945 нам. заг. аддзела ЦК КП(б)Б. У 1947—56 2-і, 1-ы сакратар Мінскага абкома КПБ, старшыня Мінскага аблвыканкома. Са жн. 1956 сакратар, з крас. 1959 2-і сакратар ЦК КПБ. У 1962—65 старшыня Бюро ЦК КПБ па кіраўніцтве сельскай гаспадаркай. У 1971—76 Старшыня Прэзідыума Вярх. Савета БССР, нам. Старшыні Вярх. Савета СССР. Канд. у чл. ЦК у 1949—56, чл. ЦК і Бюро ЦК КПБ у 1956—76. Канд. у чл. ЦК у 1956—61, чл. ЦК КПСС з 1961. Дэп. Вярх. Савета БССР у 1951—76, нам. Старшыні Прэзідыума Вярх. Савета БССР у 1955—71. Дэп. Вярх. Савета СССР у 1954—76, нам. Старшыні Савета Нацыянальнасцей Вярх. Савета СССР у 1962—66. Загінуў у аўтакатастрофе. Яго імем названа вуліца ў Мінску.

Тв.: Белорусская Советская Социалистическая Республика. М., 1972.

СУРГУ́Т, горад у Ханты-Мансійскай аўт. акрузе, у Расіі. Засн. ў 1593. 266,3 тыс. ж. (1996). Порт на правым беразе р. Об, за 10 км ад аднайменнай чыг. станцыі. Аэрапорт. Буйны цэнтр нафтаздабыўной прам-сці. Прам-сць: газаперапр., дрэваапр., харч. (рыбакансервавы з-д). Вытв-сць буд. матэрыялаў. Сургуцкая ГРЭС. Краязн. музей. За 20 км на З ад С., на правым беразе р. Об, знаходзіцца археал. помнік Барсава Гара.

СУРДАКА́МЕРА (ад лац. surdus глухі + *камера*), герметычнае памяшканне з гуканепранікальнымі сценамі. Унутр. паверхня С. забяспечвае мінім. адбіццё гукавых сігналаў. Абсталявана прыладамі і апаратамі для рэгістрацыі вынікаў выпрабаванняў і непасрэднага назірання. Выкарыстоўваецца для выпрабавання і трэніроўкі псіхічнай устойлівасці лётчыкаў, касманаўтаў ва ўмовах абс. адзіноты; правяраюцца іх здольнасць да хуткай рэакцыі, ступені стамляльнасці, уважлівасць, памяць, мысленне і інш. ва ўмовах, калі чаргуюцца перыяды абс. цішыні і розных узбуджальнікаў (напр., гукавых, светлавых сігналаў).

У.С.Ларыёнаў.



Ф.А.Сурганаў.



А.А.Суркоў.

СУРДАПЕДАГО́ГІКА (ад лац. surdus глухі + *педагогіка*), галіна *дэфекталогіі*, якая даследуе заканамернасці і асаблівасці выхавання, навучання і карэкцыі развіцця дзяцей з парушэннем слыху (глухіх і са слабым слыхам). Цесна звязана з агульнай педагогікай, *алігафрэнапедагогікай*, лагапедыяй, *псіхалогіяй*, сурдапсіхалогіяй і інш.

Першыя выказванні пра магчымасць навучання глухіх дзяцей сустракаюцца ў творах Арыстоцеля. У 16 ст. італьян. вучоны Дж. Кардана выказаў меркаванне пра магчымасць засваення мовы з дапамогай яе пісьмовай формы. У Іспаніі рабіліся спробы навучання з выкарыстаннем *дактылалогіі*. У 1620 у Мадрыдзе выдадзены першы метадычны дапаможнік для навучання глухіх дзяцей «Аб прыродзе гукаў і майстэрстве навучыць глуханямога гаварыць» Х.П.Банета. Тэарэтычнымі распрацоўкамі праблем С. ў розны час займаліся І.Аман (Нідэрланды), К.Маліш, І.Фатэр (Германія), Ш.Эпе (Францыя), А.І.Дзьячкоў, С.А.Зыкаў, М.М.Лагоўскі, Ф.А. і Ф.Ф. Раў, В.І.Флеры, П.Дз.Янько і інш (Расія).

На Беларусі даследаванні ў галіне С. вядуцца з 1960-х г. (І.М.Бобла, В.В.Дзюрыч, Т.Л.Ляшчынская). З 1970-х г. пачалі распрацоўвацца развіццёвыя тэхналогіі (Т.І.Абухава, Т.А.Грыгор'ева, С.Ф.Лявяш), з 1990-х г. — праблемы выкарыстання жэставага маўлення (Грыгор'ева, Л.С.Дзімскіс, І.К.Фамянок) і інш. Першае вучылішча для глухіх дзяцей адкрыта ў Мінску ў 1888. У 1896 І.В.Васютовіч заснаваў вучылішча ў Віцебску. Існавалі яны на дабрачынныя сродкі. У 1925 у Мсціславе пачаў працаваць т.зв. Ін-т глуханямых (пасля пераўтвораны ў школу), куды былі пераведзены навучэнцы з Мінскага і Віцебскага вучылішчаў. Выкладалі ў іх пераважна выпускнікі навуч. устаноў Масквы і Пецярбурга. У дзярж. сістэме спец. адукацыі Рэспублікі Беларусь для дзяцей з парушэннямі слыху дзейнічаюць Рэсп. цэнтр рэабілітацыі дзяцей дашкольнага ўзросту з парушэннямі слыху ў Мінску, дашкольныя аддзяленні ў Віцебску і Пінску, дзіцячы сад у Гомелі, групы ў дзіцячых садах у Брэсце, Гродне, Магілёве, Мазыры, дзіцячы дом у Бабруйску, школы ў Ашмянах, Бабруйску, Віцебску, Гарадзеі, Гомелі, Гродне, Ждановічах, Кобрыне, Мінску, Мсціславе, Пінску, Поразаве, Рэчыцы; існуюць інтэграваныя класы для дзяцей з парушэннем слыху (школа № 91, г. Мінск), класы з інтэграваным навучаннем у агульнаадук. школах і інш. (гл. *Беларускае таварыства глухіх*). Практыкуецца таксама *індывідуальнае навучанне*. Сурдапедагогаў рыхтуе Бел. пед. ун-т.

Літ.: Выхаванне дзяцей з парушаным слыхам. Мн., 1996; Григорьева Т.А. Развивающее обучение детей с нарушенным слухом. Мн., 2000; Обухова Т.И. Основы дошкольной сурдопедагогики. Мн., 2001.

Т.А.Грыгор'ева.

СУРЖЫНА́ Нона Андрэеўна (н. 17.10.1937, г. Днепрапятроўск, Украіна), украінская спявачка (мецца-сапрана). Нар. арт. СССР (1976). Скончыла Харкаўскі ін-т мастацтваў (1964). З 1963 салістка Харкаўскага, з 1974 — Днепрапятроўскага т-раў оперы і балета. Сярод партый: Кармэн («Кармэн» Ж.Бізэ), Аксіння («Ціхі Дон» І.Дзяржынскага), Саламія («Багдан Хмяльніцкі» К.Данькевіча). Дзярж. прэмія Украіны імя Т.Шаўчэнкі 1978.

СУРКІ́ (Marmota), род грызуноў сям. вавёркавых. Вядомы з верхняга міяцэну (каля 5 млн. г. назад). 14 відаў. Пашыраны ў Еўразіі і Паўн. Амерыцы. Жывуць у адкрытых ландшафтах, у гарах; селяцца ў норах. Зімой упадаюць у спячку. Некат. віды — пераносчыкі і носьбіты ўзбуджальніка чумы і інш. 2



Сурвэткі. Брэстчына (злева). Міншчына. Сярэдзіна 20 ст.



Сурок альпійскі.

віды: С. Мензбіра (M. menzbieri) і С. ванкуверскі (M. vancouverensis) занесены ў Чырв. кнігу МСАП.

Даўж. цела да 70 см, хваста да 25 см; маса да 9 кг. Афарбоўка ад светлай пясчана-вохрыстай да цёмна-бурай і вохрыста-рыжай. Тулава нязграбнае. Вушы кароткія. Кіпцюры моцныя. Расліннаедныя. Нараджаюць да 10 (звычайна 4—6) дзіцянят за год. Некат. віды — аб'екты промыслу. Гл. таксама *Байбак*, *Тарбаган*. *Э.Р.Самусенка.*

СУРКО́ВА Ларыса Канстанцінаўна (н. 7.6.1941, г. Харкаў, Украіна), бел. вучоны ў галіне пульманалогіі. Д-р мед. н. (1997). Скончыла Мінскі мед. ін-т (1964). З 1969 у НДІ пульманалогіі і фтызіятрыі (з 1986 кіраўнік лабараторыі, аддзела). Навук. працы па пытаннях патамарфозу, патагенезу, марфалогіі, імунапаталогіі туберкулёзу і інш. хвароб органаў дыхання.

Тв.: Современные аспекты патоморфоза туберкулеза легких в Республике Беларусь (разам з М.І.Дзюсьмікеевай, М.Я.Штыльманам) // Пульмонология. 1996. № 2; Роль иммунокомплексных патологических реакций в иммунопатогенезе туберкулеза легких (разам з Н.С.Шпакоўскай, М.І.Дзюсьмікеевай) // Пробл. туберкулеза. 1999. № 6.

СУРКО́Ў Аляксей Аляксандравіч (13.10.1899, в. Сераднёва Рыбінскага р-на Яраслаўскай вобл., Расія — 14.6.1983), рускі паэт, грамадскі дзеяч. Герой Сац. Працы (1969). Засл. дз. культ. Арменіі (1970). Скончыў Ін-т чырвонай прафесуры ў Маскве (1934). У 1944—46 гал. рэдактар «Литературной газеты», у 1945—53 час. «Огонек». Друкаваўся з 1918. Першая кніга вершаў — «Запеў» (1930). Зб-кі вершаў «Апошняя вайна» (1933), «Так мы раслі» (1940) прасякнутыя героікай грамадз. вайны. У песнях «Зямлянка» («Б'ецца ў цеснай пячурцы агонь...»), «Песня смелых» і інш. (Дзярж. прэмія СССР 1946), зб-ках «Снежань пад Масквой» (1942), «Расія караючая» (1944), «Свету — мір!» (1950, Дзярж. прэмія СССР 1951), «Песні пра чалавецтва» (1961), «Што такое шчасце?» (1969) услаўленне парыву да перамогі, барацьбы за мір. Неаднаразова бываў на Беларусі: удзельнік вызвалення Зах. Беларусі (1939), прысутнічаў на Нар. сходзе Зах. Беларусі (28—30.10.1939, Беласток) і інш. Па матывах бел. нар. песень напісаў вершы «Над зялёнай магілай», «Заспявала дзяўчына», «Удовіна». Партызанам Беларусі, гераізму, мужнасці і стойкасці яе народа ў Вял. Айч. вайну прысвяціў вершы «Дзед Талаш», «Беларусь», «Вораг увайшоў у мой дом і разбіў...», «Клятва над крыніцай», «Лясны бой пад Полацкам». Да 35-годдзя літ. дзейнасці Я.Купалы напісаў арт. «Народны паэт» (1940) і інш. Пераклаў вершы Я.Купалы, Я.Коласа, П.Броўкі, А.Куляшова, А.Александровіча, М.Машары. На бел. мову асобныя вершы С. перакладалі А.Астрэйка, С.Дзяргай, М.Аўрамчык, А.Вялюгін, Х.Жычка, А.Звонак, К.Кірэенка, У.Шахавец.

Тв.: Собр. соч. Т. 1—4. М., 1978—80; Бел. пер. — у кн.: Анталогія рускай савецкай паэзіі. Мн., 1936; Руская савецкая паэзія. Мн., 1953.

Літ.: Резник О.С. Алексей Сурков: Путь поэта. 3 изд. М., 1979. *У.А.Паўлаў.*

СУРМА́ (лац. Stibium), Sb, хімічны элемент V групы перыяд. сістэмы, ат. н. 51, ат. м. 121,76. Прыродная С. — сумесь 2 стабільных ізатопаў — ^{121}Sb (57,25%) і ^{123}Sb. У зямной кары $5 \cdot 10^{-5}$% па масе. Трапляецца ў выглядзе мінералаў (гл. *Сурмяныя руды*) і самародная. Вядома з глыбокай старажытнасці; упершыню ў Еўропе ўласцівасці і спосабы атрымання С. і яе злучэнняў апісаны ў 1604 алхімікам Васілём Валенцінам. Лац. назва паходзіць ад грэч. stibi (у Стараж. Грэцыі так наз. мінерал С. — *антыманіт*, парашок якога выкарыстоўвалі для чарнення броваў); рус. — ад тур. sürme — назва парашку свінцовага блішчаку PbS, якім таксама «сурмілі» бровы.

Існуе ў некалькіх алатропных мадыфікацыях. Пры атм. ціску ўстойлівая метал. С. — крышт. мадыфікацыя з гексаганальнай крышт. рашоткай. Вядомы яшчэ 2 крышт. мадыфікацыі (існуюць пры высокім ціску) і 3 няўстойлівыя аморфныя — жоўтая, чорная і выбуховая (узрываецца пры ўдары або трэнні). Метал. С. — серабрыста-белыя з сіняватым адценнем і метал. бляскам зоркападобныя крышталі, шчыльн. 6690 кг/м^3, $t_{пл}$ 630,5 °С; дыямагнетык. Крохкая; пры t>310 °С становіцца пластычнай. Устойлівая ў паветры. Растваральна ў канцэнтраваных сернай і азотнай к-тах, царскай гарэлцы. Узаемадзейнічае з галагенамі (акрамя фтору), пры нагрэванні (t>600 °С) з кіслародам (утварае сэсквіаксід Sb_2O_3), пры сплаўленні з халькагенамі і большасцю металаў (утварае антыманіды; гл. *Сурмы злучэнні*). Атрымліваюць пераважна асаджальнай плаўкай з жалезам або аднаўленчай плаўкай акісленых руд. Выкарыстоўваюць як кампанент *свінцу сплаваў* і *волава сплаваў*, для атрымання злучэнняў С., у т.л. паўправадніковых. Пыл і пара С. атрутныя: раздражняюць слізістыя абалонкі верхніх дыхальных шляхоў, вачэй, а таксама скуру, выклікаюць пнеўмасклероз; ГДК у атм. паветры 0,01 мг/м^3, у вадзе 0,05 мг/л.

Літ.: Сурьма. М., 1977; Полывянный И.Р., Лата В.А. Металлургия сурьмы. Алма-Ата, 1991.

СУ́РМАЧ Аляксандр Мікалаевіч (8.11.1941, в. Візна Падляскага ваяв., Польшча — 28.11.1985), бел. мастак дэкар.-прыкладнога мастацтва. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1972). З 1972 на Барысаўскім камбінаце прыкладнога мастацтва. Працаваў у галіне маст. керамікі (пераважна шамоце). Стварыў камплект дэкар. ваз і ваз-кашпо для адм. будынка аб'яднання «Хімвалакно» ў Магілёве (1976), дэкар. кампазіцыю «Поры года» і керамічную агароджу для Палаца культуры ў г. Беразіно (1978), камплект дэкар. блюд для рэстарана «Гродна» ў Гродне (1979), рэльеф «Музыка» для Палаца культуры тэкстыльшчыкаў у Мінску (1984), пласты «Вечар на Бярэзіне» (1979), «Кавалерыйская атака» (1982), «Салют Перамогі» (1985), дэкар. скульптуру «Песняры» (1984), «Усе на футбол» (1985), фантан «Дождж» у в. Верцялішкі Гродзенскага р-на (1973). Праз падкрэсліванне спецыфікі матэрыялу, спалучэнне традыц. форм і аўтарскай канцэпцыі дасягаў пластычнай выразнасці кампазіцыі, маст. завершанасці. *Л.Ф.Салавей.*

СУРМЫ́ ЗЛУЧЭ́ННІ, хімічныя злучэнні, у састаў якіх уваходзіць *сурма*. Выкарыстоўваюць пераважна сурмы аксіды, галагеніды і сульфіды, а таксама антыманіды.

Антыманіды (стыбніды) — злучэнні сурмы з металамі (гл. *Металіды*). Выкарыстоўваюць антыманіды алюмінію AlSb, галію GaSb і індыю InSb у паўправадніковай тэхніцы. Сурмы аксіды — злучэнні сурмы з кіслародам — Sb_2O_3 (сэсквіаксід) і Sb_2O_5. Крышт. рэчывы, нерастваральныя ў вадзе. Sb_2O_3 — бясколерныя крышталі, $t_{пл}$ 656 °С. Выкарыстоўваюць для атрымання сурмы высокай чысціні, як кампанент аптычнага шкла і эмалей, напаўняльнік тэрмаўстойлівых пластмас, пігмент (сурмяныя бялілы), антыпірэн для тканін. Sb_2O_5 — светла-жоўтыя крышталі, пры t>350 °С раскладаюцца. Выкарыстоўваюць у тэкст. і гумавай прам-сці, у вытв-сці спец. шкла, керамікі, фарбаў і лакаў, для ат-



А.**Сурмач**. Фантан «Дождж». Вёска Верцялішкі Гродзенскага раёна. 1973.

рымання антыманатаў солей сурмянай к-ты $H[Sb(OH)_6]$ (існуе толькі ў растворы). Сурмы галагеніды — злучэнні сурмы з *галагенамі*: трыгалагеніды $SbHal_3$ і пентагалагеніды фтору SbF_5 і хлору $SbCl_5$. Найб. практычнае значэнне мае трыхларыд $SbCl_3$ — бясколернае крышт. рэчыва, $t_{пл}$ 73,4 °С, растваральнае ў вадзе з раскладаннем. Атрымліваюць узаемадзеяннем Sb_2O_3 з канцэнтраванай салянай к-той. Выкарыстоўваюць як каталізатар у арган. сінтэзе, пратраву пры фарбаванні тканін, вадкі як няводны растваральнік. Сурмы сульфіды — злучэнні сурмы з серай — Sb_2S_3 (сэсквісульфід) і Sb_2S_5. Цвёрдыя, нерастваральныя ў вадзе, пірафорныя рэчывы. Sb_2S_3 існуе ў 2 мадыфікацыях — крышт. (шэрыя крышталі, $t_{пл}$ 559,5 °С; у прыродзе — мінерал *антыманіт*) і аморфнай (аранжавага колеру). Sb_2S_5 — аранжавачырв. аморфнае рэчыва, у вакууме пры t>120 °С раскладаецца на Sb_2S_3 і серу. Выкарыстоўваюць як кампаненты піратэхн. саставаў, Sb_2S_3 як кампанент галовак запалак і рубінавага шкла, паўправадніковы матэрыял у фотарэзістарах і электронна-прамянёвых прыладах. С.з. атрутныя, асабліва хларыды і фтарыды (ГДК 0,3 мг/м³) і сурмы гідрыд SbH_3 (сурмяністы вадарод, стыбін — бясколерны газ з непрыемным пахам; ГДК 0,5 мг/м³).

СУРМЯ́НЫ БЛІШЧА́К, другая назва мінералу *антыманіт*.

СУРМЯ́НЫЯ РУ́ДЫ, прыродныя мінеральныя ўтварэнні, якія выкарыстоўваюць для прамысл. здабычы *сурмы*. Вылучаюць уласна С.р. (монаметальныя), комплексныя і сурмазмяшчальныя. Уласна С.р. маюць гал. прамысл. значэнне і падзяляюцца на вельмі багатыя, або штуфныя (20—50% сурмы), багатыя (6—12%), радавыя (2—6%), бедныя (1—2%) і ўбогія (да 1%). Паводле саставу падзяляюцца на сульфідныя (больш за 70% гал. мінералу *антыманіту*), сульфідна-аксідныя (30—50% сурмы ў аксіднай і гідраксіднай форме) і аксідныя (больш за 50% сурмы ў аксідных злучэннях). Комплексныя С.р. падзяляюцца на ртутна-сурмяныя, сурмяна-поліметалічныя, золата-сурмяныя, сурмяна-вальфрамавыя і інш.; сурмазмяшчальныя руды — на 2 падтыпы: мінералы сурмы ўтвараюць невял. гнёзды багатых руд; сурма ізаморфна ўваходзіць у крышт. рашотку інш. мінералаў у поліметалічных рудах або ўтварае тонкую ўкрапанасць. Паходжанне гідратэрмальнае. Радовішчы ў Балівіі, Паўд.-Афр. Рэспубліцы, Мексіцы, Турцыі, Кітаі, Расіі і інш.



М.Сурначоў.

СУРНАЧО́Ў Мікола (Мікалай Мікалаевіч; 1917, в. Слабада Рагачоўскага р-на Гомельскай вобл. — 20.4.1945), бел. паэт. Вучыўся ў Гомельскім (1937—39) і Мінскім (1939—41) пед. ін-тах. Працаваў у газ. «Звязда» (1939—40) і «Чырвоная змена» (1940—41). Загінуў на фронце. Друкаваўся з 1933. Найб. значная лірыка перыяду Вял. Айч. вайны (анталагічным стаў верш-балада «У стоптаным жыце»). У вершах славіў подзвіг салдата, выказваў веру ў перамогу. Асаблівасці яго паэзіі: лірызм, рамантычная ўзнёсласць, лаканічнасць, ёмістасць вобразаў і дэталей, моцны ўплыў паэтыкі нар. песні, сюжэтная завершанасць, выразны рытм і разнастайнасць інтанацый.

Тв.: На сурмах баравых. Мн., 1946; Барвовая зара. Мн., 1959; Акопны спеў. Мн., 1986.

Літ.: Пранузя П. Такі ён быў // Полымя. 1966. № 6; Аўрамчык М. Недаспяваная песня // Маладосць. 1969. № 6.

І.У.Саламевіч.

«СУРО́ВЫ СТЫЛЬ», умоўная назва вобразна-стылістычнага кірунку ў творчасці групы сав. мастакоў канца 1950—пач. 70-х г. Зварот мастакоў да паказу жыцця і працы сав. чалавека ў суровых прыродных умовах, стойкасць і гераізм у пераадоленні цяжкасцей вымагалі новых сродкаў выразнасці, здольных максімальна поўна і шматбакова перадаць пафас і маштабнасць працы, супярэчлівы дынамізм жыцця. Творам «С.с.» ўласцівы шырокая абагульненасць і манументальнасць вобразаў, адмаўленне ад апавядальнай ілюстрацыйнасці, строгая прастата і выразнасць стылізаванай формы, інтанацыі рамантычнага, публіцыстычнага характару. Спецыфічная лапідарнасць маст. мовы «С.с.» дасягалася строгім адборам і актывізацыяй рытму, сілуэта, буйных колеравых плям. З мэтай найб. поўнага выяўлення ідэйнай праграмы «С.с.» мастакі звярталіся да пластычнай і жывапіснай метафары, алегорыі, сімвала, мантажнага вырашэння твора. Найб. паслядоўна рысы «С.с.» выявіліся ў творах жывапісцаў М.Андронава, А.Васняцова, М.Грэку, Э.Ілтнера, Г.Коржава, П.Ніканава, В.Папкова, Т.Салахава, А. і П. Смоліных.

У бел. выяўл. мастацтве ідэйна-эстэт. прынцыпы «С.с.» найб. выразныя ў творах на тэмы працы і асабліва Вял. Айч. вайны. Для іх характэрны эпічная гераізацыя, асэнсаванне асобы ў шырокім кантэксце нар. жыцця, нац. гісторыі: асобныя творы Б.Аракчэева, Л.Асядоўскага, Г.Вашчанкі, В.Грамыкі, М.Данцыга, Л.Дударэнкі, М.Залознага, А.Малішэўскага, Г.Паплаўскага, М.Савіцкага, Л.Шчамялёва. У рэчышчы



Да арт. **«Суровы стыль»**. М.Савіцкі. Партызаны. 1963.



Да арт. **«Суровы стыль»**. В.Папкоў. Шынель бацькі. 1972.



Да арт. **«Суровы стыль»**. М.Залозны. Салдаткі. 1969.

«С.с.» працавалі скульптары В.Грос, М.Якавенка. *Б.А.Крэпак, Э.М.Пугачова.*

СУ́РСКІ Алег Аркадзьевіч (н. 16.4.1928, Тбілісі), бел. мастацтвазнавец, мастак. Скончыў БДУ (1952). У 1950—57 працаваў у друку, у 1963—68 выкладаў у БПІ, у 1972—74 у Бел. філіяле Усесаюзнага НДІ тэхн. эстэтыкі, адначасова з 1960 працаваў на Мінскім маст. камбінаце. Адзін з афарміцеляў экспазіцыі Дзярж. музея этнаграфіі народаў СССР у Ленінградзе, дыярам «Дарога жыцця» (1958) для Музея гісторыі Ленінграда, «Краснаярская ГЭС» (1959) для ВДНГ СССР у Маскве. Аўтар пано «Геральдыка гарадоў Беларусі» для павільёна Беларусі на Міжнар. кірмашы ў Лейпцыгу (1966, чаканка, у сааўт.), дэкар. асвятляльных кампазіцый у санаторыях «Сосны» Мядзельскага р-на (1975), «Беларусь» у Місхоры (Крым, 1973), Сочы (1985, у сааўт.), у будынках Нац. банка Беларусі (1990), у будынках — помніках архітэктуры 18 — пач. 20 ст.; банкаў у Гомелі і Брэсце (1996), у Магілёўскім маст. музеі імя П.Масленікава (2001) і інш. Аўтар прац, прысвечаных творчасці сучасных бел. мастакоў (М.Данцыга, В.Грамыкі, В.Сумарава, А.Кроля), альбома-манаграфіі «Беларускае мастацкае шкло» (1978) і інш.

СУ́РСКІ Дзмітрый Алегавіч (н. 8.10.1959, Мінск), бел. дызайнер, мастак. Сын А.А.*Сурскага.* Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1982). З 1982 мастак-канструктар Усесаюзнага НДІ тэхн. эстэтыкі, у 1988—89 заг. сектара ін-та «Белбыттэхпраект». Сярод асн. работ: праекты і мадэлі-ўзоры «Гарадскі аўтамабіль» (1982) і «Санітарна-гігіенічны комплекс» (1998), асартыменту нажніц (1986), фірменныя стылі спарт. цэнтра «Волат» (1990), Палаца Рэспублікі (1999), плакаты «Эканомія ў быце» (1985), «Хлеб усяму галава», «Кадры вырашаюць усё» (абодва 1989), рэкламныя плакаты. Аўтар-складальнік каталога «Знак: Лагатып» (2000), альманаха «PRO дизайн» (з 2001). З 1995 прэзідэнт Бел. саюза дызайнераў.

СУРТА́ Іван Захаравіч (22.11.1893, в. Бяседавічы Хоцімскага р-на Магілёўскай вобл. — 20.12.1937), бел. дзярж. дзеяч; адзін з арганізатараў аховы здароўя на Беларусі. Акад. АН Беларусі (1936). Скончыў 2-і Маскоўскі ун-т (1918), Ін-т чырв. прафесуры (1932). У 1933 нам. наркома асветы Беларусі, з 1933 нарком аховы здароўя Беларусі, у 1936—37 прэзідэнт АН Беларусі. Навук. працы па пытаннях метадалогіі і гісторыі прыродазнаўства. Рэпрэсіраваны ў 1937 і расстраляны. Рэабілітаваны ў 1956.

Тв.: І.П.Паўлаў і яго вучэнне // Зап. Бел. Акад. навук. 1936. Кн. 5.



А.**Сурскі**. Люстра. 2001.



Дз.**Сурскі**. Санітарна-гігіенічны комплекс. 1998.



І.З.**Сурта**.



Р.Ф.**Сурус**.

СУ́РТА Трафім Раманавіч, магілёўскі летапісец канца 17 — пач. 18 ст. Быў купецкім старастам, неаднаразова выбіраўся ў магістрат лаўнікам. У традыц. пагадовай форме склаў першы магілёўскі летапіс (звесткі за 1526—1701), які ўвайшоў у *Магілёўскую хроніку.* Гісторыю Магілёва пачаў з 1526, найб. падрабязна апісаў падзеі 2-й пал. 17 ст. Цікавіўся гісторыяй Расіі, Польшчы, у летапісе выкарыстаў хронікі А.Гваньіні і М.Стрыйкоўскага, Кіеўскі сінопсіс, розныя гіст. запісы. Належаў да патрыятычна настроенай гар. арыстакратыі, цесна звязанай з нац.-культ. традыцыямі. Прытрымліваўся памяркоўных поглядаў. Асуджаў выступленні магіляўчан супраць гар. улад (паўстанне 1610 называў бунтам), адмоўна ставіўся да уніятаў, не ўхваляў дзеянні ўкр. казакоў на Беларусі.

Літ.: Зборнік матэрыялаў магілёўскіх чытанняў «Трафім Сурта і яго час». Магілёў, 1993. *В.А.Чамярыцкі.*

СУ́РУС Рыгор Фёдаравіч (н. 22.7.1942, г. Улан-Удэ, Бурація), бел. кампазітар. Засл. дз. маст. Беларусі (1985). Скончыў Бел. кансерваторыю (1969, кл. А.*Багатырова*). У 1969—72 выкладаў у муз. школе пры Бел. кансерваторыі. Для творчасці С. характэрны пазітыўнае светаўспрыманне, пашыраны вобразна-тэматычны і жанравы дыяпазон: ад гераікі да мяккага гумару, ад акадэмічнасці да фальклярызму і эстраднасці, ад інстр. мініяцюр да буйных муз.-тэатр. кампазіцый. Музыка вызначаецца дэмакратычнасцю, сувязямі з фальклорнымі крыніцамі, пранікнёны меладызм спалучаецца з гнуткай выразнай рытмікай; шырока выкарыстоўвае прынцып астынатнасці, поліфанію. Сярод твораў: нар. муз. камедыя «Несцерка» (паст. 1979), гераічная муз. камедыя «Судны час» (паст. 1984); балет «Кірмашовыя забавы» (1993); сюіта «Сваток» (1972) і паэма «Памяці герояў» (1975) для салістаў,

хору і сімф. арк.; сімф. варыяцыі (1966), «Святочная увертюра» (1979), сімфонія (1969; 2-я рэд. 1992), канцэрт «На Купалле» (1995), сімфонія-канцэрт «Каляды. Ражаство» (2000; усе для сімф. арк.); канцэрты для скрыпкі з арк. (1972), «Юнацкі» для фп. з арк. (1987); творы для арк. бел. нар. інструментаў, для эстр. арк., у т.л. «Інтэрмецца» (1964), «Святочны вальс» (1975), «Восеньскі накцюрн» (1977), «Лірычны экспромт», «Рамантычны вальс» (абодва 1984), «З добрай раніцай», «Успамін» (абодва 1985), «Аднойчы вечарам», «Зорны вальс», «Бэзавы сад» (усе 1986); творы для фп., баяна, цымбалаў, скрыпкі, флейты, кларнета; вак. і хар. творы a'cappella на бел. тэксты (больш за 20), у т.л. кантата «Шлюбная» (1998), апрацоўкі бел. нар. песень, рамансы, песні. Лаўрэат Усесаюзнага конкурсу «Па месцах баявога паходу» (1980).

Н.А.Юўчанка.

СУРХО́Б, назва р. *Вахш* у Таджыкістане паміж вусцямі рэк Муксу і Абіхінгоу.

СУ́РЫКАЎ Васіль Іванавіч (24.1.1848, г. Краснаярск, Расія — 19.3.1916), рускі жывапісец. Правадз. чл. Пецярб. АМ (1893). Вучыўся ў Пецярбургскай АМ (1869—75) у П.Чысцякова. Чл. т-ва перасоўных маст. выставак (гл. *Перасоўнікі*, 1881), Саюза рус. мастакоў. Гал. тэма творчасці — лёс народа ў складаныя пераломныя эпохі гісторыі Расіі. Ужо ў ранніх творах звяртаўся да гіст. тэматыкі («Княжацкі суд», 1874; «Апостал Павел тлумачыць догматы веры ў прысутнасці цара Агрыпы», 1875). З 1877 жыў у Маскве. Наведаў Германію, Францыю, Аўстрыю (1883—84), Швейцарыю (1897), Італію (1900), Іспанію (1910). У лепшых палотнах раскрываў трагічныя супярэчнасці гісторыі, логіку яе руху, барацьбу гіст. сіл у пятроўскі час, у гады расколаў, нар. рухаў: «Раніца стралецкай кары» (1881), «Меншыкаў у Бярозаве» (1883), «Баярыня Марозава» (1887). У манум. па форме карцінах С. стварыў наватарскі тып кампазіцыі, у якой рух людской масы, ахопленай складанай гамай перажыванняў, перадае глыбокі, унутр. сэнс падзеі. Вял. ўвагу аддаваў перадачы выгляду плошчаў і вуліц старой Масквы, запоўненых натоўпам, адзення, прадметаў побыту, вышыўкі, разьбы па дрэве і інш. Агульны каларыт яго твораў, заснаваны на гармоніі чыстых фарбаў, рытме колеравых плям, фактуры і манеры мазкоў, служыў сродкам перадачы агульнага настрою, атмасферы падзеі, псіхал. характарыстыкі персанажаў. У 1888—90 жывапісам не займаўся. У карцінах 1890-х г. звярнуўся да падзей нац. гісторыі, у якіх праяўляўся гераічны дух і магутнасць рус. народа: «Пакарэнне Сібіры Ермаком» (1895), «Пераход Суворава праз Альпы» (1899), стварыў партрэты («Сцяпан Разін», 1903, і інш.), займаўся акварэллю.

Літ.: Кеменов В.С. Историческая живопись Сурикова, 1870—1880-е гг. М., 1963; Его ж. В.Суриков: Альбом. Л., 1978; В.И.Суриков: Письма. Воспоминания о художнике. Л., 1977. *Л.Ф.Салавей.*

СУ́РЫКАЎ Іван Захаравіч (6.4.1841, в. Навасёлава Яраслаўскай вобл., Расія — 6.5.1880), рускі паэт. Самастойна навучыўся грамаце і вершаскладанню. Друкаваўся з 1864. Выдаў зб-кі вершаў (1871, 1875, 1877). Асн. тэмы яго паэзіі — жыццё сялян, гарадской беднаты, цяжкая доля жанчыны. У творах з рус. гісторыі бунтарскі настрой: паэмы «Пакаранне смерцю Сценькі Разіна», «Садко» (на яе аснове аднайм. опера М.Рымскага-Корсакава). Многія вершы прысвечаны рус. прыродзе, дзецям. Творчасць С. звязана з фальклорам. Некат. яго вершы сталі папулярнымі нар. песнямі: «Рабіна» («Што стаіш, гайдаешся...», «У стэпе» (у нар. апрацоўцы «Стэп ды стэп вакол...») і інш. Па яго ініцыятыве падрыхтаваны калектыўны зб. «Світанак» (1872), які стаў пачаткам існавання Сурыкаўскага літ.-муз. гуртка (існаваў да 1933).

Тв.: Стихотворения. М., 1983.

Літ.: Неженец Н.И. Поэзия И.З.Сурикова. Л., 1979.



В.**Сурыкаў**. Меншыкаў у Бярозаве. 1883.



М.А.**Сурын**.

СУ́РЫН Віталь Міхайлавіч (н. 17.1.1940, в. Мірадзіна Бабруйскага р-на Магілёўскай вобл.), бел. вучоны ў галіне тэхн. механікі. Д-р тэхн. н. (1993), праф. (1994). Скончыў БПІ (1961). З 1968 у Фіз.-тэхн. ін-це АН Беларусі. З 1972 у Бел. ун-це інфарматыкі і радыёэлектронікі (з 1985 заг. кафедры). Навук. працы па даследаванні ўздзеяння ўмоў дэфармацыі на ўласцівасці нержавейных аўстэнітных сталей, метадах паскоранай ацэнкі паказчыкаў надзейнасці вырабаў электроннай тэхнікі.

Тв.: Испытание на усталость методом качающейся частоты // Изв. вузов. Машиностроение. 1988. № 1; Влияние отношения амплитуд бигармонического вибронагружения на параметры кривой усталости (разам з Б.С.Міхалёвым) // Завод. лаборатория. 1993. № 3.

СУ́РЫН Марцін Акімавіч (17.5.1908, в. Руднае Чашніцкага р-на Віцебскай вобл. — 24.4.1963), Герой Сав. Саюза (1945). У Вял. Айч. вайну з 1944 на Зах. фронце. Стралок радавы С. вызначыўся ў 1944 у баях на тэр. Літвы, дзе ў ліку першых фарсіраваў р. Нёман і Шашупе, удзельнічаў у абароне захопленых плацдармаў. Пасля вайны працаваў у калгасе.

СУРЫНА́М (Suriname), Рэспубліка Сурынам (нідэрл. Republiek Suriname), дзяржава на ПнУ Паўд. Амерыкі. Мяжуе на З з Гаянай, на Пд з Бразіліяй, на У з Гвіянай (франц.); на Пн абмываецца Атлантычным акіянам. Пл. 163,3 тыс. км^2. Нас. 434 тыс. чал. (2001). Дзярж. мова — нідэрландская, распаўсюджаны англ., хіндзі, яванская. Сталіца — г. *Парамарыба*. Краіна падзяляецца на 10 акруг. Нац. свята — Дзень незалежнасці (25 ліст.).

Дзяржаўны лад. С. — рэспубліка. Дзейнічае канстытуцыя 1987. Кіраўнік дзяржавы — прэзідэнт, якога выбірае парламент на 5 гадоў. Заканад. ўлада належыць аднапалатнай Нац. асамблеі (выбіраецца насельніцтвам на ўсеагульных выбарах, 51 дэпутат). Выканаўчую ўладу ўзначальвае прэм'ер-міністр.

Прырода. На ўзбярэжжы ч. *Гвіянскай нізіны*, у цэнтры і на Пд *Гвіянскае пласкагор'е*, хрыбты і горныя масівы да 1280 м. Карысныя выкапні: баксіты (запасы

больш за 8 млрд. т, адно з першых месц у свеце), нафта, руды жалеза, ніобію, волава, танталу; золата, плаціна, алмазы, буд. матэрыялы і інш. Клімат субэкватарыяльны, гарачы і вільготны. Сярэднія месячныя т-ры 26—28 °С. Ападкаў 2000—3000 мм за год. Рэкі многаводныя, парожыстыя, багатыя на гідраэнергію. Вільготныя экватарыяльныя лясы з каштоўнымі пародамі дрэў займаюць каля 85% тэр. Месцамі другасныя хмызнякі, участкі саваннаў. У складзе жывёльнага свету: малпы, ягуары, пумы, тапіры. Шмат птушак, паўзуноў, насякомых. Прыродны парк Браўнсберг, некалькі рэзерватаў.

Насельніцтва. Жывуць сурынамцы, або сурынамскія крэолы (еўрап.-афрыканскія мулаты, 31%), блізкія да іх па мове і культуры негры (10%), індыйцы (37%), яванцы (15%), індзейцы (карэнныя жыхары, 2%), кітайцы (2%), еўрапейцы (1%) і інш. Вернікі індуісты (27%), пратэстанты (25%), католікі (23%), мусульмане (20%) і інш. Сярэднегадавы прырост насельніцтва 0,6% (2001). Сярэдняя шчыльн. 2,7 чал. на 1 км^2. Каля 90% насельніцтва жыве на ўзбярэжжы і ў далінах гал. рэк, якія складаюць 3—4% тэрыторыі. У гарадах жыве 74% насельніцтва. Найб. г. Парамарыба — каля 250 тыс. ж. з прыгарадамі (2001). У астатніх гарадах насельніцтва не перавышае 10 тыс. ж. У сельскай гаспадарцы і рыбалоўстве занята каля 20% працаздольнага насельніцтва, у прам-сці і буд-ве — каля 10%, у абслуговых галінах — каля 70%.

Гісторыя. Узбярэжжа С. адкрыта ісп. мараплаўцам А.*Ахедам* у 1499. У 1551 галандскія гандляры заснавалі пасяленне ў вусці р. Сурынам (адсюль назва краіны). У канцы 16 ст. тут замацаваліся іспанцы, у 1630 — англічане. Паводле англа-нідэрл. дагавора 1667 Вялікабрытанія ўступіла С. Нідэрландам у абмен на нідэрл. ўладанні ў Паўн. Амерыцы. Асновай эканомікі Нідэрл. Гвіяны (тагачасная назва С.) была плантацыйная гаспадарка; для працы на плантацыях прывозілі рабоў з Афрыкі, пасля скасавання рабства ў 1863 — закантрактаваных рабочых з Індыі і Інданезіі, нашчадкі якіх цяпер складаюць найб. шматлікую этнічную групу С. У 1954 С. атрымаў аўтаномію ў складзе Каралеўства Нідэрландаў.

25.11.1975 абвешчана незалежнасць С. У лют. 1980 уладу захапілі ваенныя на чале з Д.Боўтэрсе. У 1980-я г. ў С. склалася напружаная паліт. сітуацыя, якая ўскладнялася ўзбр. барацьбой супраць цэнтр. ўрада. У выніку пагаднення ў маі 1991 адбыліся свабодныя выбары. У 1992 падпісана мірнае пагадненне паміж урадам С. і ўзбр. групоўкамі. На выбарах у маі 2000 перамог Новы фронт за дэмакратыю і развіццё, яго лідэр Р.Венетыян стаў прэзідэнтам. С. — чл. ААН (з 1975). Дзейнічаюць паліт. партыі: Новы фронт за дэмакратыю і развіццё, Нац. дэмакр. партыя.

Гаспадарка. С. — краіна сярэдняга ўзроўню развіцця з развітой горназдабыўной прам-сцю. Валавы ўнутр. прадукт (ВУП) у 1999 склаў 1,48 млрд. дол., па 3,4 тыс. дол. на 1 чал. У прам-сці ствараецца 22% ВУП, у сельскай гаспадарцы — 13%, у абслуговых галінах — 65%. Найб. развіта гарнарудная прам-сць. Здабываюць баксіты (больш за 4 млн. т штогод, каля 5—10% сусв. выт-сці), нафту — каля 1 млн. т, марганцавую руду і золата. Баксітаздабыўную прам-сць кантралююць кампаніі ЗША і Нідэрландаў. Баксітавыя руднікі ў басейнах рэк Сурынам і Котыка, каля гарадоў Мунга і Паранам, распрацоўка адкры-





Герб і сцяг **Сурынама**.

тым спосабам. У 1999 атрымана 1,9 млрд. кВт·гадз электраэнергіі, у т.л. 74% на ГЭС (буйнейшая з іх Бракапонда на р. Сурынам), 26% на цеплавых электрастанцыях. Развіта выт-сць гліназёму (штогод больш за 1 млн. т) і алюмінію (каля 30—40 тыс. т), лесапілаванне і дрэваапрацоўка. Невял. прадпрыемствы цэм., абутковай, тэкст. і тытунёвай прам-сці, па выт-сці цукру, рому, мелесу, пальмавага алею, жывёльнага масла, маргарыну, па апрацоўцы рыбы і крэветак. Саматужныя промыслы. У сельскай гаспадарцы выкарыстоўваецца 117 тыс. га зямлі, у т.л. 95 тыс. га пад ворывам, 7 тыс. га пад шматгадовымі насаджэннямі, 15 тыс. га пад пашай.



Арашаецца 60 тыс. га. Амаль усе с.-г. землі знаходзяцца ва ўзбярэжжы. Пераважаюць плантацыйныя гаспадаркі. Гал. культура — рыс (больш за 50% ворыва, штогод збіраюць 2 ураджаі, каля 300 тыс. т); вырошчваюць бананы, цукр. трыснёг, арахіс, маніёк, агародніну. Трапічнае садоўніцтва (апельсіны, грэйпфруты). Плантацыі кавы, какавы, алейных і какосавых пальмаў. У жывёлагадоўлі найб. развіта гадоўля буйн. раг. жывёлы (102 тыс. галоў, 1997) і птушкагадоўля (2,2 млн. курэй разам з бройлерамі). Рыбалоўства (13 тыс. т, 1999), промысел крэветак. Нарыхтоўка драўніны каштоўных парод. Транспарт пераважна аўтамаб., унутр. водны і марскі. Даўж. аўтадарог 4,5 тыс. км, у т.л. 1,2 тыс. км з цвёрдым пакрыццём; унутр. водных шляхоў — 1,2 тыс. км, чыгункі — 166 км (1996). У краіне 46,4 тыс. легкавых, 19,3 тыс. грузавых аўтамашын і аўтобусаў, 46 аэрапортаў (2000). Гал. марскі порт Парамарыба, паблізу міжнар. аэрапорт. У 1999 экспарт склаў 443 млн. дол., імпарт — 525 млн. дол. У экспарце пераважаюць баксіты, гліназём і алюміній (разам па кошце больш за 80%), нафта, драўніна, крэветкі, рыба, рыс, бананы; у імпарце — машыны і абсталяванне, нафтапрадукты, харч. прадукты, спажывецкія тавары. Гал. гандл. партнёры: ЗША (23% экспарту, 35% імпарту), Нідэрланды (11% і 15%), Нарвегія (19% экспарту), Трынідад і Табага (12% імпарту), Японія, Вялікабрытанія. Замежны турызм у 1998 даў даход 44 млн. дол. Грашовая адзінка — сурынамскі гульдэн.

І.Я.Афнагель (прырода, насельніцтва, гаспадарка).

СУРЭНЬЯ́НЦ, Сурэнянц Вардгес (27.2.1860, Ахалцыхе, Грузія — 6.4.1921), армянскі мастак. Вучыўся ў Маскоўскім вучылішчы жывапісу, скульптуры і дойлідства (1876—79). Скончыў Мюнхенскую АМ (1885). З 1894 экспанент, з 1910 чл. Т-ва перасоўных маст. выставак (гл. *Перасоўнікі*). Жыў у Маскве, Пецярбургу, Ялце. Першы ў арм. жывапісе звярнуўся да гіст. жанру; аўтар карцін на тэмы нар. легенд, партрэтаў, пейзажаў: «Пакінутая» (1894), «Зняважаная святыня» (1895), «Царква Рыпсімэ» (1897), «Альгамбра» (1897), «Семіраміда каля трупа Ара Прыгожага» (1899), «Саламея» (1907) і інш. Афармляў літ. творы («Бахчысарайскі фантан» А.Пушкіна, 1899; казкі О.Уайльда, 1909; арм. нар. казкі, 1906—14), спектаклі ў Маскоўскім маст. т-ры, Марыінскім т-ры і Т-ры В.Камісаржэўскай у Пецярбургу і інш.

СУ́Р'Я (літар. — сонца), у старажытнаіндыйскай міфалогіі: 1) бог Сонца, адзін з 8 багоў — захавальнікаў свету, цар Паўд. Захаду, усёвідушчае вока *Мітры* і інш. багоў. Яго ўяўлялі чалавекам, птушкай або лятучым вожыкам. У

міфах С. нараджаецца на У, выходзіць з нябеснай брамы і за дзень абыходзіць зямлю і неба. Ён азарае свет, разганяе цемру, хваробы і ворагаў, дорыць людзям здароўе, працвітанне і патомства. 2) Дачка сонечнага бога Сур'і.

СУСА́К (Butomus), род кветкавых раслін сям. сусаковых. 1 від — С. парасоністы (B. umbellatus). Пашыраны ва ўмераным поясе Еўразіі і як заносны ў Паўн. Амерыцы. На Беларусі трапляецца ў прыбярэжнай зоне стаячых і з павольнай плынню вадаёмаў, забалочаных месцах.

Шматгадовыя травяністыя расліны з паўзучым, мясістым карэнішчам, выш. да 150 см. Лісце доўгае, лінейнае, у прыкаранёвай разетцы. Кветкі бела-ружовыя, на доўгіх кветаножках. Плод — шматлістоўка. Карэнішчы маюць каля 60% крухмалу, бялок, цукар, спажываюцца ў ежу. Са сцёблаў і лісця выраблюць маты, кошыкі. Харч., кармавыя (для андатры, бабра, вадаплаўных птушак), тэхн., дэкар. расліны. *А.М.Скуратовіч.*

СУСА́ЛЬ, тое, што *золата сусальнае*.

СУСА́НАА (Такэхая Сусанаана мікота літар. доблесны, хуткі, заўзяты бог-муж з Суса), у японскай міфалогіі адзін з трох «высокіх» дзяцей-багоў Ідзанакі (гл. *Ідзанакі і Ідзанамі*), які пры падзеле сваіх уладанняў аддаў С. раўніну мора. Верагодна, першапачаткова С. шанавалі як аднаго з багоў, што персаніфікавалі буру і водную стыхію. Пазней узнікла ўяўленне пра С. як пра боскага продка родаў, звязаных з мясцовасцю Ідзума, і культ. героя, які прыходзіць на дапамогу людзям.

СУСА́НІН Іван Восіпавіч (?, с. Дзераванькі б. Кастрамскога пав. — сак. 1613), рускі селянін, які ахвяраваў сабой дзеля выратавання цара ў перыяд *вайны Рэчы Паспалітай з Расіяй 1609—18*. У сак. 1613 атрад шляхты Рэчы Паспалітай, які накіроўваўся да с. Домніна (вотчына Раманавых за 3 км ад с. Дзераванькі) з мэтай захапіць толькі што абранага царом *Міхаіла Фёдаравіча* Раманава, узяў С. праваднікам. С. паслаў свайго зяця Б.Сабініна папярэдзіць цара, а сам наўмысна завёў атрад у непраходны балоцісты лес, за гэта закатаваны. Ушаноўваецца як нац. герой рус. народа. У гонар С. названы гар. пасёлак і раён у Кастрамской вобл., яго подзвіг адлюстраваны ў маст. л-ры, у оперы М.І.Глінкі «Жыццё за цара» («Іван Сусанін»). У Кастраме помнік (1967). У Вял. Айч. вайну 1941—45 подзвіг С. на Беларусі паўтарылі І.С.Цуба (гл. *Цубы*), І.Ю.*Філідовіч* і інш.

СУСВЕ́Т, бясконцы ў часе і прасторы і бязмежна разнастайны па сваіх формах свет; усё, што існуе. У шырокім сэнсе С. з'яўляецца прадметам вывучэння ўсяго прыродазнаўства, кожная з галін якога даследуе пэўны бок С. У больш вузкім сэнсе навукай пра С. з'яўляецца *астраномія*. Будову С. як цэлага вывучае *касмалогія*.



Сур'я. Камень. 10 ст.

Развіццё ўяўленняў пра С. прайшло некалькі этапаў. У старажытнасці пад С. разумелася населеная частка Зямлі. У Стараж. Грэцыі ўяўленні пра С. звязаны з адкрыццём шарападобнасці Зямлі, аддаленасці нябесных свяціл (Піфагор, Арыстоцель) і гіпотэзай пра рух Зямлі (Філалай, Арыстарх Самоскі). У сярэдневякоўі ўсталявалася *геацэнтрычная сістэма свету* Пталамея. Пераварот ва ўяўленнях пра С. звязаны з канцэпцыямі М.*Каперніка* (гл. *Геліяцэнтрычная сістэма свету*), у якой Зямля разглядалася як звычайнае нябеснае цела, і Дж.*Бруна*, які прыйшоў да высновы пра бясконцасць зорнага С. З 19 ст. С. даследаваўся як зорная сістэма Млечнага Шляху (*Галактыка*). Новы этап у развіцці ўяўленняў пра С. звязаны з абгрунтаваннем у 20 ст. існавання інш. галактык і пераходам да вывучэння *Метагалактыкі*, ажыццяўленнем запуску першых штучных спадарожнікаў Зямлі і асваенне касм. прасторы.



Сусак парасоністы.

СУСВЕ́ТНАГА ПРЫЦЯГНЕ́ННЯ ЗАКО́Н, Ньютана закон прыцягнення, закон *прыцягнення* ў класічнай механіцы. Паводле С.п.з. кожныя матэрыяльныя целы з масамі m_1 і m_2 прыцягваюцца ў напрамку адно да аднаго з сілай $\vec{F}(r)$, модуль якой прама прапарцыянальны здабытку іх мас і адваротна прапарцыянальны квадрату адлегласці r паміж целамі: $F = Gm_1m_2/r^2$, дзе G — *гравітацыйная пастаянная*. Адкрыты І.*Ньютанам* у 1665—66 на аснове аналізу *Кеплера законаў* (апублікаваны ў 1687).

С.п.з. апісвае гравітацыйнае ўзаемадзеянне ў выпадку слабых палёў прыцягнення і малых скарасцей руху ўзаемадзейных цел. Справядлівы для цел адвольнай формы, лінейныя памеры якіх значна меншыя за адлегласць паміж імі, а таксама для шаравых цел з аднародным ці канцэнтрычным размеркаваннем шчыльнасці мас унутры цела. Сіла $\vec{F}(r)$ з'яўляецца *патэнцыяльнай сілай*, таму гравітацыйнае поле апісваецца скалярным патэнцыялам $\varphi(r)$, які задавальняе *Пуасона ўраўненне* і пры цэнтральна-сіметрычным размеркаванні рэчыва роўны $\varphi = -GM/r$, дзе M — поўная маса крыніцы поля. Паколькі сіла прыцягнення, што дзейнічае на пробнае цела, прапарцыянальная яго масе, то набытае целам паскарэнне залежыць толькі ад гравітацыйнага патэнцыялу: $\vec{g}(r) = -grad\ \varphi$. С.п.з. пацверджаны астр. назіраннямі за рухам цел Сонечнай сістэмы, падвойных зорак, прадказаннем планеты Нептун. Мяркуюць, што ў касм. маштабах ён выконваецца да $r \sim 10^{20}$ м. На малых адлегласцях праверка С.п.з. ўпершыню праведзена Г.*Кавендышам* у 1798. Паводле сучасных эксперым. даных (2001), С.п.з. выконваецца да $r \sim 2 \cdot 10^{-4}$ м. На яго аснове тлумачацца марскія прылівы і адлівы, вызначаюцца рух, будова і эвалюцыя нябесных цел, іх масы і фігуры.

Літ.: Сретенский Л.Н. Теория ньютоновского потенциала. М.; Л., 1946; Дубошин Г.Н. Теория притяжения. М., 1961; Богородский А.Ф. Всемирное тяготение. Киев, 1971; Экспериментальные тесты теории гравитации. М., 1989. *М.М.Касцюковіч.*

СУСВЕ́ТНАЕ АБ'ЯДНА́ННЕ БЕЛАРУ́СКАЙ ЭМІГРА́ЦЫІ (САБЭ). Існавала ў канцы 1940 — пач. 1950-х г. з месцам знаходжання ў Парыжы. Засн. на 1-м сусв. з'ездзе бел. эміграцыі (адбыўся 28.11—2.12.1948 з удзелам 22 дэлегатаў ад беларусаў Францыі, Вялікабрытаніі, Германіі, Бельгіі, Даніі, Італіі, Швецыі, Аргенціны, Канады, Аўстраліі), скліканым ініцыятыўным к-там бел. эміграцыі ў Францыі «дзеля гуртавання ўсіх нацыянальных сілаў беларускай эміграцыі і каардынацыі яе арганізацыйна-творчай працы». У кіруючы орган (урад) аб'яднання ўваходзілі

Л.*Рыдлеўскі* (старшыня), У.Шыманец (нам. старшыні), Я.Сурвіла (сакратар), В.*Жук-Грышкевіч*, У.Тамашчык і інш. У 1949—50 у Парыжы выходзіў інфарм. бюлетэнь арганізацыі, які рэдагаваў Рыдлеўскі.

Літ.: З гісторыяй на «Вы»: Публіцыстыч. арт. Мн., 1994. Вып. 3. С. 48—57, 63.

У.Я.Калаткоў.

СУСВЕ́ТНАЯ АРГАНІЗА́ЦЫЯ АХО́ВЫ ЗДАРО́ЎЯ (САЗ), міжнародная міжурадавая арганізацыя, спецыялізаваная ўстанова ААН. Створана ў 1946 з мэтай барацьбы з асабліва небяспечнымі хваробамі, распрацоўкі міжнар. сан. правіл, паляпшэння сан. стану знешняга асяроддзя, распрацоўкі міжнар. стандартаў лекаў, арганізацыі дапамогі краінам, якія сталі на шлях развіцця, і г.д. Месцазнаходжанне — Жэнева (Швейцарыя). Вышэйшы орган — Сусв. асамблея аховы здароўя, сесіі якой склікаюцца штогод. Другі кіруючы орган — Выканаўчы камітэт. Цэнтр. адм. орган — Сакратарыят на чале з ген. дырэктарам. Членамі САЗ з'яўляюцца каля 190 дзяржаў, у т.л. Рэспубліка Беларусь.

СУСВЕ́ТНАЯ АРГАНІЗА́ЦЫЯ ІНТЭЛЕКТУА́ЛЬНАЙ УЛА́СНАСЦІ (САІУ), міжнародная міжурадавая арганізацыя, спецыялізаваная ўстанова ААН (з 1974). Створана ў 1967 для садзейнічання ахове аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці. Месцазнаходжанне — Жэнева (Швейцарыя). Вышэйшы орган — Ген. асамблея. Адм. орган — Міжнар. бюро. Дзейнасць САІУ пашыраецца на ўсе віды інтэлектуальнай уласнасці: права на літ., маст. і навук. творы, ахова выканаўчай дзейнасці артыстаў, вынаходстваў і да т.п. На канец 2000 членамі арг-цыі з'яўляліся больш за 130 дзяржаў, у т.л. Рэспубліка Беларусь.

СУСВЕ́ТНАЯ ВАЙНА́, глабальнае проціборства кааліцый (саюзаў, блокаў) дзяржаў з выкарыстаннем усіх форм барацьбы (узбр., паліт., эканам., ідэалаг. і дыпламат.). У адрозненне ад *лакальнай вайны* С.в. ахоплівае большасць краін свету, вял. тэрыторыі. Паліт. змест і характар С.в., як і кожнай інш. вайны, вызначаецца мэтамі бакоў, якія ваююць. Гл. таксама *Вайна*, *Першая сусветная вайна 1914—18*, *Другая сусветная вайна 1939—45*.

СУСВЕ́ТНАЯ ГАНДЛЁВАЯ АРГАНІЗА́ЦЫЯ (СГА), міжнародная арганізацыя. Засн. ў 1994 (дзейнасць пачала ў 1995) як пераемніца Ген. пагаднення па тарыфах і гандлі 1948 для стварэння агульных інстытуцыянальных рамак з уключэннем усіх прынятых пад яго патранажам дамоўленасцей і пагадненняў. Мэты СГА: камерцыйная і эканам. арыентацыя дзяржаў-членаў на павышэнне ўзроўню жыцця; забеспячэнне поўнай занятасці; рост вытв-сці і гандл. абмену таварамі і паслугамі; аптымальнае выкарыстанне крыніц сыравіны з мэтай забеспячэння доўгатэрміновага развіцця, абароны і захавання навакольнага асяроддзя. Знаходзіцца ў Швейцарыі.

СУСВЕ́ТНАЯ ГАСПАДА́РКА, сукупнасць нац. гаспадарак усіх краін свету, іх эканам. узаемасувязей і ўзаемаадносін, уключаючы *знешні гандаль*, *вываз капіталу*, міграцыю рабочай сілы. Эканам. сувязі паміж рознымі рэгіёнамі і краінамі свету пачалі складвацца ў старажытнасці (Індыя, Кітай, Егіпет, Грэцыя, Рым). У сярэднія вякі праз гандаль актыўна пачалі наладжваць міжнар. эканам. адносіны Партугалія, Італія (Генуя, Венецыя), Іспанія, Вял. Ноўгарад. Але з-за адсутнасці дастатковых сродкаў зносін, нязначнага ўдзелу грошай (пераважаў натуральны тавараабмен) міжнар. эканам. сувязі мелі эпізадычны, абмежаваны характар. З'яўленне ў канцы 18 ст. буйной *машыннай вытворчасці*, трансп. сістэм і камунікацый значна павялічыла вываз і продаж за мяжу тавараў. Эканам. сувязі пачалі набываць стабільны, дынамічны характар. Замест часовых рэгіянальных пачаў складвацца *сусветны рынак*. Капіталіст. *спосаб вытворчасці* напачатку эканам., а потым паліт. і ваен. сродкамі разбурыў феад. замкнёнасць мясц. рынкаў, змяніў структуру таварных патокаў, стварыў эканам. ўмовы рухомасці тэхнікі, тэхналогій, міграцыі рабочай сілы. Для шэрагу прамыслова-развітых краін узнікла неабходнасць набываць сыравіну, паліва, матэрыялы ў інш. краінах. Гандлёва-эканам. сувязі дапаўняюцца вытв. і фін.-эканам., ствараецца інтэрнац. адзінства капіталу і эканам. жыцця, развіваецца *міжнародны падзел працы*. Такім чынам, на базе сусв. капіталіст. гаспадаркі і па законах яе развіцця ў канцы 19 ст. стварылася С.г. У перыяд яе станаўлення ў сферу міжнар. падзелу працы ўваходзілі таксама зоны каланіяльнага панавання і краіны, дзе захоўваліся феад. адносіны. Пасля 1917 у сістэму С.г. ўвайшлі СССР і інш. сацыяліст. краіны; у выніку распаду каланіяльнай сістэмы — краіны, якія сталі на шлях развіцця. Апошнія ў большасці ўваходзілі ў сістэму капіталіст. вытв. адносін, але разнастайная і спецыфічная ўнутр. структура іх эканомік вылучала гэтыя краіны ў самаст. групу. Да пач. 1990-х г. сістэма С.г. падзялялася на капіталіст., сацыяліст. і краін, якія развіваюцца; у ёй панаваў дух саперніцтва і супрацьстаяння. Узніклі буйныя рэгіянальныя аб'яднанні па супрацоўніцтве ў эканам., сац. і культ. сферах: *Савет Эканамічнай Узаемадапамогі* (1949), *Еўрапейская эканамічная супольнасць* (1957), *Бенілюкс* (1958), Еўрапейская асацыяцыя свабоднага гандлю (1960), *Асацыяцыя дзяржаў Паўднёва-Усходняй Азіі* (1967) і інш. Перамены, якія ў апошнія гады адбываюцца ў б. сацыяліст. краінах, змянілі ўзаемаадносіны ў С.г. Пашырыліся эканам. кантакты, паглыбіўся міжнар. падзел працы, узмацніліся інтэграцыйныя працэсы ў эканоміцы. З'явіліся новыя эканам. аб'яднанні: *Еўрапейскі саюз* (1993), *Сусветная гандлёвая арганізацыя* (1995) і інш. З 1.1.2002 некаторыя еўрап. краіны перайшлі на адзіную валюту еўра. Аднак у канцы 20 ст. палітыка некаторых эканам. развітых краін, накіраваная на захаванне існуючага стану размеркавання і выкарыстання сусв. прыродных рэсурсаў, значна замарудзіла інтэграцыйныя працэсы. Гэтая палітыка выклікала негатыўную рэакцыю з боку многіх краін Азіі, Афрыкі і Лац. Амерыкі, а таксама часткі насельніцтва развітых краін, што выяўляецца, у прыватнасці, у руху антыглабалістаў.

І.В.Катляроў

СУСВЕ́ТНАЯ КАНФЕДЭРА́ЦЫЯ ПРА́ЦЫ (СКП; The World Confederation of Labour), міжнароднае аб'яднанне *прафесійных саюзаў*. Засн. ў 1920 як Міжнар. канфедэрацыя хрысц. прафсаюзаў (МКХП). У канцы 1990-х г. аб'ядноўвала каля 26 млн. членаў у 113 краінах. МКХП была створана пад эгідай Ватыкана на ідэйнай платформе сац. дактрыны каталіцызму; у 1968 «дэхрысціянізавана» (выключаны адсылкі на сац. прынцыпы хрысціянства) і пераназвана ў СКП. Выступае за мірнае супрацоўніцтва паміж прадпрымальнікамі і наёмнымі работнікамі (але патрабуе некат. сац.-эканам. уступак работнікам), вырашэнне міжнар. спрэчак мірнымі сродкамі, раўнапраўныя эканам. адносіны паміж развітымі краінамі і краінамі, што развіваюцца, супраць праяў *апартэіду* і *расізму*. Рэгіянальныя арг-цыі ў Еўропе, Афрыцы, Азіі і Лац. Амерыцы. Вышэйшы орган — кангрэс, а паміж яго сесіямі — савет. Бягучымі справамі загадвае выканаўчае бюро. Месцазнаходжанне кіруючых органаў СКП — г. *Брусель*.

СУСВЕ́ТНАЯ МЕТЭАРАЛАГІ́ЧНАЯ АРГАНІЗА́ЦЫЯ (СМА). Засн. ў 1947 пры ААН для міжнар. супрацоўніцтва і даследавання ў галіне метэаназіранняў і каардынацыі дзейнасці нац. метэаралагічных і гідраметэаралагічных службаў. Членамі СМА з'яўляюцца больш як 162 дзяржвы, у т.л. Беларусь (з 1948). Вышэйшы яе орган — Сусв. метэаралагічны кангрэс, які склікаецца раз у 4 гады. Выканаўчы к-т складаецца з 24 дырэктараў нац. службаў і склікаецца не радзей як раз у год. Службы у буйных геагр. цэнтрах каардынуюць 6 рэгіянальных асацыяцый. Пастаянна дзеючы орган — Сакратарыят, які знаходзіцца ў г. Жэнева (Швейцарыя).

СУСВЕ́ТНАЯ СІЯНІ́СЦКАЯ АРГАНІЗА́ЦЫЯ (ССА). Створана ў 1897 па ініцыятыве Т.*Герцля*. Да 1960 наз. Сіяністцкая арганізацыя. Кіруе сіяністцкім рухам (гл. *Сіянізм*) у дыяспары, садзейнічае дзяржаве Ізраіль у развіцці і засяленні краіны яўр. імігрантамі. Складаецца з тэрытарыяльных арг-цый, якія аб'ядноўваюць удзельнікаў сіяністцкага руху ў асобных краінах. Вышэйшы орган ССА — Сіяністцкі кангрэс,

які склікаецца раз у некалькі гадоў; да 1946 кангрэсы адбываліся ў розных гарадах Еўропы, потым у Іерусаліме. Паміж кангрэсамі ССА кіруе Выканаўчы к-т на чале з праўленнем. Органамі ССА з'яўляюцца Трыбунал кангрэса, Яўрэйскае агенцтва і інш. З пач. існавання вяла прапагандысцкую і практычную дзейнасць па адстойванні тэзіса аб адзінай яўр. нацыі, змагалася супраць асіміляцыі яўрэйства ў дыяспары, арганізоўвала перасяленні ў Палесціну (потым у Ізраіль). У пач. 20 ст. дзейнічала на тэр. Рас. імперыі (у т.л. на Беларусі) праз сетку сіянісцкіх арг-цый (*Гехалуц*, *Паалей Цыён*, «Сіянісцкая сацыялістычная партыя» і інш).

СУСВЕ́ТНАЯ СЛУ́ЖБА НАДВО́Р'Я, сістэма 3 сусветных (Вашынгтон, Масква, Мельбурн) і больш за 20 рэгіянальных метэаралагічных цэнтраў. План С.с.н. прыняты ў 1967. Міжнар. супрацоўніцтва *службаў надвор'я* розных краін каардынуе *Сусветная метэаралагічная арганізацыя*, якая аб'ядноўвае 162 краіны, у т.л. Беларусь (1997). Цэнтры С.с.н. збіраюць і аўтаматызавана апрацоўваюць звесткі пра стан надвор'я на зямным шары. Яны выкарыстоўваюць назіранні пастаянна дзеючых метэаралагічных і аэралагічных сетак, станцый ракетнага зандзіравання, караблёў надвор'я, метэаралагічных спадарожнікаў, складаюць прыземныя і вышынныя карты надвор'я, інш. прагнозныя матэрыялы і распаўсюджваюць апрацаваную інфармацыю.

СУСВЕ́ТНАЯ СПА́ДЧЫНА, прыродныя аб'екты і помнікі культуры краін і народаў свету, якія маюць унікальную каштоўнасць, з'яўляюцца здабыткам усяго чалавецтва і падлягаюць калектыўнай адказнасці за іх захаванне. У рамках Канвенцыі аб ахове культ. і прыроднай спадчыны, прынятай Ген. канферэнцыяй ЮНЕСКА (1972, дакумент набыў сілу ў 1975, калі колькасць дзяржаў-бакоў дасягнула 20), дзейнічае Камітэт С.с. з прадстаўнікоў 21 краіны. На падставе вызначаных крытэрыяў ён разглядае унікальныя культ. і прыродныя аб'екты і ўключае іх у спіс С.с.

Помнікі культуры С.с. павінны адпавядаць наступным крытэрыям: складаць унікальны ансамбль; быць аб'ектам, які значна паўплываў на жыццё краіны; служыць сведчаннем зніклай цывілізацыі; ілюстраваць пэўны важны перыяд у гісторыі дзяржавы ці народа; з'яўляцца унікальным узорам традыц. ладу жыцця; звязаны з ідэямі або вераваннямі, што маюць сусв. значэнне. Прыродныя аб'екты С.с. павінны: ілюстраваць пэўны этап эвалюцыі Зямлі; наглядна адлюстроўваць сучасныя геал. працэсы; быць унікальнымі прыроднымі аб'ектамі, выключнымі сваёй прыгажосцю; з'яўляцца месцам пражывання знікаючых відаў раслін і жывёл. Шэраг помнікаў і аб'ектаў, уключаных у спіс С.с., адпавядае некалькім названым крытэрыям. Кожная дзяржава, што падпісала Канвенцыю, падае ў к-т пералік культ. і прыродных каштоўнасцей, якія маюць агульначалавечае значэнне. Гэтым яна бярэ на сябе абавязак ахоўваць названыя нац. скарбы. Калі К-т уносіць іх у спіс, у рамках Фонду С.с., заснаванага Канвенцыяй, дзяржава можа ў той ці іншай форме атрымаць дапамогу для забеспячэння захаванасці помніка ці аб'екта. Фонд фарміруецца з узносаў дзяржаў-бакоў і грашовых сум, унесеных краінамі, установамі і прыватнымі асобамі. З яго сродкаў аказваецца матэрыяльная і тэхн. дапамога краінам, якім яна патрэбна, а таксама фінансуецца падрыхтоўка спецыялістаў. Да Канвенцыі далучыліся (2000) 122 краіны, у т.л. Беларусь (з 1988). У спіс С.с. (вядзецца ў алфавітным парадку) уключаны 690 аб'ектаў (529 культурных, 138 прыродных, 23 мяшаныя), сярод іх асобныя арх. збудаванні і ансамблі — *Афінскі акропаль*, *Ам'енскі сабор*, *Шартрскі сабор*, *Кіеўскі Сафійскі сабор*; гіст. цэнтры *Варшавы*, *Вільнюса*, *Рыгі*, *Крэмль Маскоўскі і Красная плошча* (Расія); гарады — *Бразілія*, *Венецыя* і інш.; нац. паркі — *Вялікага Бар'ернага Рыфа* (Аўстралія), *Белавежскі нацыянальны парк* (Польшча) і інш. На Беларусі ў спіс С.с. ўключаны *Белавежская пушча* (1979) і *Мірскі замкава-паркавы комплекс* (2000).

Літ.: Кисель В.П. Памятники Всемирного наследия. 2 изд. Мн., 2001. *В.П.Кісель.*

СУСВЕ́ТНАЯ СТРАТЭ́ГІЯ АХО́ВЫ ПРЫРО́ДЫ, праграма мер па *ахове прыроды* ў глабальным маштабе. Распрацавана *Міжнародным саюзам аховы прыроды і прыродных рэсурсаў* (МСАП) пры ўдзеле *Міжнароднай праграмы ААН па навакольным асяроддзі* (ЮНЕП), *Сусветнага фонду дзікай прыроды*, *харчовай і сельскагаспадарчай арганізацыі ААН* (ФАО), *Арганізацыі Аб'яднаных нацый па пытаннях адукацыі, навукі і культуры* (ЮНЕСКА). Прынята XIV Ген. асамблеяй МСАП (1978; Ашгабат). Праграма абагульняе вопыт усіх краін у шматгадовай дзейнасці па ахове прыроды, характарызуе асн. экалагічныя праблемы сучаснасці, прапануе сістэму рацыянальных метадаў кіравання дзейнасцю чалавека па выкарыстанні рэсурсаў біясферы.

Літ.: Ефремов Ю.К., Хозин Г.С. Всемирная стратегия охраны природы. М., 1981; Аллен Р. Как спасти Землю: Всемирная стратегия охраны природы: Пер. с англ. М., 1983.

СУСВЕ́ТНАЯ ФЕДЭРА́ЦЫЯ ДЭМАКРАТЫ́ЧНАЙ МО́ЛАДЗІ (СФДМ), міжнародная дэмакр. арг-цыя, якая аб'ядноўвае моладзь розных паліт. поглядаў (але пераважна левасацыяліст. і камуніст. арыентацыі), рэліг., расавай, нац. прыналежнасці і сац. становішча. Засн. 10.11.1945 на Сусв. канферэнцыі моладзі ў Лондане (з гэтага часу 10 ліст. адзначаецца як Сусв. дзень моладзі). У 2-й пал. 1980-х г. СФДМ аб'ядноўвала больш за 270 маладзёжных арг-цый амаль са 100 краін. З іх значную ч. складалі камуніст. маладзёжныя арг-цыі СССР і інш. сацыяліст. краін. Сав. моладзь (у т.л. беларускую) у СФДМ прадстаўлялі ВЛКСМ (38 млн. чл. у 1988) і К-т маладзёжных арг-цый СССР. Колькасць членаў і міжнар. ўплыў СФДМ значна скараціліся ў 1990-я г. з ліквідацыяй сацыяліст. арыентацыі ў рэспубліках б. СССР і краінах Цэнтр. і Усх. Еўропы: камуніст. маладзёжныя арг-цыі тут спынілі існаванне або страцілі масавасць. З часу заснавання СФДМ вядзе барацьбу за мір і правы моладзі, незалежнасць народаў, супраць праяў імперыялізму, глабалізму, *неакаланіялізму*, *фашызму* і *расізму*; у 1947—2001 арганізавала і правяла 15 *Сусветных фестываляў моладзі і студэнтаў*. Вышэйшы орган СФДМ — Ген. асамблея (да 1957 Кангрэс), выканаўчыя органы — Выканком і Бюро СФДМ; бягучыя справы вядзе Сакратарыят (у Будапешце). Бел. моладзь прадстаўляе ў СФДМ адроджаны (1992) *Камуністычны Саюз Моладзі Беларусі*.

СУСВЕ́ТНАЯ ФЕДЭРА́ЦЫЯ ПАРАДНЁНЫХ ГАРАДО́Ў, гл. ў арт. *Параднёныя гарады*.

СУСВЕ́ТНАЯ ФЕДЭРА́ЦЫЯ ПРАФСАЮ́ЗАЎ (СФП; The World Federation of Trade Unions), міжнародная арг-цыя *прафесійных саюзаў*. Створана 3.10.1945 на Сусв. кангрэсе прафсаюзаў у Парыжы па ініцыятыве брыт. і сав. прафсаюзаў. У канцы 1990-х г. аб'ядноўвала каля 130 млн. сапр. і асацыіраваных членаў, каля 60 нац. прафс. аб'яднанняў. Асн. задачы СФП паводле статута: барацьба супраць вайны і яе сац.-эканам. і паліт. перадумоў, абарона інтарэсаў працоўных ва ўсім свеце, арг-цыя агульнай барацьбы прафсаюзаў усіх краін супраць замахаў на эканам. і сац. правы працоўных і іх эканам. свабоды, арганізацыя асв. работы сярод членаў прафсаюзаў па пытаннях міжнар. адзінства працоўных і інш. Напачатку СФП аб'ядноўвала ўсе найб. прафсаюзы свету, акрамя Амерыканскай федэрацыі працы (АФП). У 1949 з'яе вылучыліся і разам з АФП утварылі *Міжнародную канфедэрацыю свабодных прафсаюзаў* рэфармісцкія прафсаюзы Вялікабрытаніі, ЗША і інш. краін. У 1989 СФП аб'ядноўвала больш за 90 нац. прафс. цэнтраў з 82 краін агульнай колькасцю больш за 200 млн. членаў. Большасць з іх былі членамі прафсаюзаў СССР і сацыяліст. краін Еўропы. Пасля спынення існавання сацыяліст. сістэмы ў Еўропе і распаду СССР СФП перажывае крызіс. У 1990-я г. яе пакінулі многія прафсаюзы краін Цэнтр., Усх. Еўропы і рэспублік б. СССР. Вышэйшы орган СФП — кангрэс. Паміж кангрэсамі кіруе Ген. савет, паміж яго пленумамі — Бюро. Месцазнаходжанне кіруючых органаў — г. Прага (да 1951 — Парыж, у 1951—56 — Вена). *М.Г.Нікіцін.*

СУСВЕ́ТНАЯ ХА́РТЫЯ ПРЫРО́ДЫ, міжнародны прыродаахоўны дакумент

ААН, у якім вызначаны асн. прынцыпы аптымізацыі адносін чалавецтва і навакольнага асяроддзя, канкрэтныя меры па іх ажыццяўленні. Прынята Ген. Асамблеяй ААН у 1982. Асн. мэта — мабілізацыя сусв. грамадскасці, народаў і ўрадаў на актыўную дзейнасць па захаванні прыроднага асяроддзя. Складаецца з прэамбулы і 3 раздзелаў.

У п р э а м б у л е адзначаецца, што прырода для чалавека з'яўляецца адзінай крыніцай энергіі і пажыўных рэчываў і ўплывае на развіццё ўсёй культуры чалавецтва. Любая форма жыцця з'яўляецца унікальнай і заслугоўвае павагі безадносна ад ступені яе сённяшняй карысці для чалавека. У 1-м раздзеле адзначаецца непарушнасць асн. прыродных працэсаў, зберажэнне генет. асновы жыцця і інш.; у 2-м — што ўмовай задавальнення патрэбнасцей чалавецтва з'яўляецца выкарыстанне біял. рэсурсаў у межах іх здольнасці да ўзнаўлення і інш.; у 3-м — пра замацаванне прынцыпаў С.х.п. ў заканадаўстве і практычнай дзейнасці дзяржаў.

СУСВЕ́ТНЫ АКІЯ́Н, гл. ў арт. *Акіян*.

СУСВЕ́ТНЫ БАНК, міжнародная арг-цыя, створаная для аказання эканам. дапамогі краінам-удзельніцам. У асноўным сродкі вылучаюцца на ўмацаванне эканомікі краін, якія сталі на шлях развіцця. Звычайна С.б. фінансуе доўгатэрміновыя інвестыцыі ў інфраструктуру (дарогі, тэлекамунікацыі, электразабеспячэнне), с.-г. і прамысл. праекты, праграмы ў галіне сац. забеспячэння, адукацыі, прафес. падрыхтоўкі і інш. Уключае 3 міжнар. фін. ін-ты са статусам самаст. спецыялізаваных устаноў ААН: *Міжнародны банк рэканструкцыі і развіцця*, *Міжнародная фінансавая карпарацыя*, *Міжнародная асацыяцыя развіцця*.

СУСВЕ́ТНЫ ВОДАПАДЗЕ́Л, г а л о ў н ы в о д а п а д з е л, водападзел, які адмяжоўвае басейны рэк, што ўпадаюць у Атлантычны і Паўн. Ледавіты ак. ад басейнаў рэк Ціхага і Інд. акіянаў. Праходзіць праз найвыш. пункты ўсіх мацерыкоў, за выключэннем Аўстраліі.

СУСВЕ́ТНЫ ДЗЕНЬ АХО́ВЫ НАВАКО́ЛЬНАГА АСЯРО́ДДЗЯ. Адзначаецца штогод 5 чэрв. з мэтай прыцягнення ўвагі сусв. грамадскасці да праблем аховы навакольнага асяроддзя. Устаноўлены Канферэнцыяй ААН па навакольным асяроддзі (Стакгольм, 1972). На Беларусі адзначаецца з 1973. У гэты дзень пры ўдзеле членаў *Беларускага таварыства аховы прыроды* арганізуюцца кангрэсы, навук.-практычныя канферэнцыі, кінафестывалі і інш. мерапрыемствы па выхаванні ашчадных адносін да прыроды, па далучэнні насельніцтва да практычнай работы па прадухіленні неспрыяльнага ўздзеяння вытв. і гасп. дзейнасці чалавека на навакольнае асяроддзе.

СУСВЕ́ТНЫ ПАДЗЕ́Л ПРА́ЦЫ, гл. ў арт. *Міжнародны падзел працы*.

СУСВЕ́ТНЫ ПАШТО́ВЫ САЮ́З (СПС), міжнародная міжурадавая арг-цыя; спецыялізаваная ўстанова ААН (з 1947). Засн. ў 1874 на 1-м Міжнар. паштовым кангрэсе; да 1878 наз. Усеагульны паштовы саюз. Мэта яго стварэння — удасканаленне міжнар. паштовай службы. Членамі СПС з'яўляюцца 175 краін, у т.л. Беларусь (з 1947). Гал. органы: Усв. паштовы кангрэс, Выканаўчы к-т, Кансультатыўны савет па паштовых даследаваннях, Міжнар. бюро (сакратарыят). Штаб-кватэра у г. Берн (Швейцарыя).

СУСВЕ́ТНЫ РЫ́НАК, сістэма ўстойлівых таварна-грашовых адносін паміж краінамі, якія звязаны ўдзелам у *міжнародным падзеле працы*; сукупнасць нац. рынкаў, якія ўзаемазвязаны і ўзаемадзейнічаюць праз розныя формы эканам. адносін. С.р. узнік у 16 ст. на мануфактурнай стадыі развіцця грамадскай вытв-сці. Пачаў актыўна фарміравацца пад уплывам руху гандлёвага капіталу, які эканамічна і палітычна ўсталяваўся ў большасці еўрап. краін. Наступная стадыя развіцця С.р. звязана з прамысл. рэвалюцыяй 18—19 ст., якая буйную прам-сць паставіла ў залежнасць ад *знешняга гандлю*. Завяршальны этап яго фарміравання адносіцца да канца 19 — пач. 20 ст., характарызуецца ростам *міжнароднага гандлю*, зменамі ў структуры гандл. патокаў, якія ўзаемна перапляліся нац. эканомікі. С.р. актыўна ўплывае на эканам. адносіны і макраэканам. раўнавагу адасобленых гасп. сістэм, інтэрнацыяналізацыю вытв-сці і капіталу. На аснове канкурэнтнай барацьбы вызначае структуру і аб'ём экспарту тавараў, узровень міжнар. падзелу працы, міграцыі рабочай сілы і інш. Гл. таксама *Сусветная гаспадарка*.

СУСВЕ́ТНЫ САВЕ́Т МІ́РУ (ССМ), кіруючы орган *Руху прыхільнікаў міру*. Засн. ў 1950. Прадстаўляе больш за 200 нац. арг-цый з больш як 150 краін. Прэзідэнт ССМ — Е.Махерас (з 1990). Сакратарыят знаходзіцца ў г. Хельсінкі.

СУСВЕ́ТНЫ САВЕ́Т ЦЭ́РКВАЎ (ССЦ; World Council of Churches), міжнародны цэнтр экуменічнага руху (гл. *Экуменізм*). Засн. ў 1948 на 1-й Генеральнай асамблеі ССЦ у Амстэрдаме як аб'яднанне 3 пратэстанцкіх рухаў («Вера і парадак», «Жыццё і дзейнасць», «Міжнародны місіянерскі савет»). Рэзідэнцыя ССЦ у г. Жэнева. Мэта ССЦ — садзейнічанне збліжэнню хрысц. цэркваў у пытаннях веравызнання. На асамблеях ССЦ распрацоўваецца агульная хрысц. праграма, накіраваная на сац. і эканам. пераўтварэнне свету, абмяркоўваюцца глабальныя праблемы чалавецтва і шляхі выхаду з сац.-эканам. і экалагічнага крызісаў. ССЦ аб'ядноўвае больш за 300 рэліг. аб'яднанняў са 100 краін свету. У яго склад уваходзяць пратэстанцкія і правасл. арг-цыі, у т.л. *Руская праваслаўная царква* (з 1961).

СУСВЕ́ТНЫ ФОНД ДЗІ́КАЙ ПРЫРО́ДЫ (World Wildlife Fund; ВВФ), міжнародная грамадская арганізацыя, асн. мэта якой — збор сродкаў для здзяйснення канкрэтных праектаў па ахове дзікіх жывёл і прыродных згуртаванняў. Засн. ў 1961. Штаб-кватэра ў г. Глан (Швейцарыя). Аддзяленні ў 27 краінах. Арганізуе мерапрыемствы (пераважна ў краінах, якія развіваюцца), фінансуе навук. экспедыцыі, арэнду зямель для стварэння ахоўных тэр. і інш. Напр., на сродкі і пры садзейнічанні фонду створаны нац. парк Ману ў вярхоўях р. Амазонка (Перу), Біял. станцыя імя Ч.Дарвіна на в-ве Санта-Крус (архіпелаг Галапагас), марскія запаведнікі, праведзены мерапрыемствы па ратаванні дажджавых лясоў в-ва Суматра (Інданезія). Фонд вядзе агітац. і асв. дзейнасць, выдае штогоднік «World Wildlife» і газ. «WWF-news», кнігі, плакаты і інш. Для ўзнагароды дзеячаў па ахове прыроды засн. «Залаты медаль».



Эмблема **Сусветнага фонду дзікай прыроды**.

СУСВЕ́ТНЫЯ РЭЛІ́ГІІ, *рэлігіі*, якія маюць найб. колькасць паслядоўнікаў ва ўсім свеце. Да іх адносяцца *хрысціянства*, *будызм* і *іслам*. Характарызуюцца універсальным, касмапалітычным веравучэннем і празелетызмам (імкненнем перавярнуць у сваю веру прыхільнікаў інш. рэлігій).

СУСВЕ́ТНЫ ЧАС, сярэдні сонечны час *Грынвіцкага мерыдыяна*. Выкарыстоўваецца пры астр. назіраннях, у міжнар. тэлеграфнай і тэлетайпанай сувязі і інш. Гл. таксама *Мясцовы час*, *Паясны час*.

СУСВЕ́ТНЫЯ ФЕСТЫВА́ЛІ МО́ЛАДЗІ І СТУДЭ́НТАЎ, традыцыйныя масавыя міжнар. святы прадстаўнікоў дэмакр. моладзі і студэнтаў, накіраваныя на развіццё дружбы і ўзаемаразумення паміж моладдзю і народамі розных краін, на ўмацаванне міру. Асн. арганізатар — *Сусветная федэрацыя дэмакратычнай моладзі*. Праграмы фестываляў разнастайныя: сустрэчы дэлегацый, семінары, дыспуты, маніфестацыі, спарт. спаборніцтвы, маст. конкурсы, выстаўкі і інш. У 1947—2001 адбылося 15 фестываляў: у Празе (1947), Будапешце

(1949), Берліне (1951), Бухарэсце (1953), Варшаве (1955), Маскве (1957), Вене (1959), Хельсінкі (1962), Сафіі (1968), Берліне (1973), Гаване (1978), Маскве (1985), Пхеньяне (1989), Гаване (1997), Алжыры (2001). Алжырскі фестываль 2001 праходзіў пад лозунгам «За ўсеагульную салідарнасць, мір і дружбу»; абмяркоўваліся найважн. сусв. праблемы (наступ неалібералізму і глабалізму, расавая дыскрымінацыя, рэліг. фундаменталізм, маладзёжнае беспрацоўе і адукацыя і інш.), ставіліся пытанні аб узмацненні антыімперыяліст. барацьбы і міжнар. салідарнасці моладзі. Моладзь Беларусі ўдзельнічала ва ўсіх С.ф.м. і с., акрамя Алжырскага. *М.Г.Нікіцін.*

СУСВЕ́ТНЫЯ ЦЭ́НЫ, *цэны*, якія дзейнічаюць на *сусветным рынку*, па якіх ажыццяўляюцца самыя буйныя экспартна-імпартныя здзелкі; сярэднія значэнні цэн на пэўныя тавары, устаноўленыя ў розных краінах. Вылічаюцца ў *свабодна канверсоўнай валюце* з улікам *базісных цэн*, якія адлюстроўваюць дынаміку цэн на пэўны тавар, умоў транспарціроўкі і аб'ёму закупак гэтага тавару. Значна ўплываюць на ўнутр. цэны розных краін. У СССР мелі абмежаванае выкарыстанне ў сувязі з устанаўленнем дзярж. цэн на імпартныя тавары і забаронай абароту замежных валют. У постсав. краінах наглядаецца тэндэнцыя набліжэння цэн да С.ц. Гл. таксама *Імпарт*, *Экспарт*.

СУ-СЕНТ-МАРЫ́ (Sault Sainte Marie), каналізаваны водны шлях на мяжы ЗША і Канады, які злучае азёры Верхняе і Гурон. Праходзіць у абход парогаў на р. Сент-Мэрыс. Адкрыты ў 1855. Складзены з 3 паралельных каналаў: 2 у ЗША (даўж. паўн. 2,6 км, глыб. 7,5 м; даўж. паўд. 2,5 км, глыб. 5,5 м) і 1 у Канадзе (даўж. 2,2 км, глыб. 6,7 м). Грузаабарот каля 100 млн. т за год.

СУ́СЛАЎ Віктар Паўлавіч (13.4.1909, г. Уфа, Расія — 19.6.1996), бел. вучоны ў галіне механізацыі сельскай гаспадаркі. Д-р тэхн. н. (1974), праф. (1975). Скончыў Томскі індустрыяльны ін-т (1934). З 1947 дырэктар Мінскага трактарнага з-да, з 1951 дэкан ф-та ў БПІ, у 1954—59 дырэктар Бел. ін-та механізацыі сельскай гаспадаркі (адначасова з 1956 заг. кафедры, з 1981 праф.). Навук. працы па арганізацыі і тэхналогіі рамонтна-абслуговай вытв-сці ў аграпрамысл. комплексе.

Тв.: Управление качеством ремонта сельскохозяйственных машин. Мн., 1981 (разам з В.В.Суславым); Машинные дворы и ремонтные мастерские для сельскохозяйственной техники. 2 изд. Мн., 1986 (разам з Л.В.Суславым, В.В.Суславым); Ремонт и хранение техники в сельском хозяйстве. Мн., 1989 (разам з М.М.Падлекаравым, В.В.Суславым).

Л.В.Бароўка.

СУ́СЛАЎ Міхаіл Андрэевіч (21.11.1902, с. Шахаўское Паўлаўскага р-на Ульянаўскай вобл., Расія — 25.1.1982), савецкі парт. дзеяч. Двойчы Герой Сац. Працы (1962, 1972). Скончыў Маскоўскі ін-т нар. гаспадаркі (1928), выкладаў у ВНУ Масквы. З 1931 у апараце ЦКК ВКП(б) і СНК СССР, з 1937 — Растоўскага абкома партыі. 1-ы сакратар Стаўрапольскага крайкома (1939—44), чл. ЦК ВКП(б) (з 1941). У Вял. Айч. вайну чл. Ваен. савета Паўн. групы войск Закаўк. фронту, нач. Стаўрапольскага краявога штаба партыз. атрадаў. Старшыня бюро ЦК па Літ. ССР (1944—46), сакратар ЦК партыі (з 1947). Адначасова ў 1949—50 гал. рэдактар газ. «Правда». Чл. Палітбюро (Прэзідыума) ЦК КПСС (1952—53, 1955—82).

СУ́СЛАЎ Уладзімір Васілевіч (1857—1921), рускі архітэктар. Скончыў Пецярбургскую АМ (1893). Вывучаў і прапагандаваў помнікі стараж.-рус. архітэктуры. На Беларусі рэстаўрыраваў *Камянецкую вежу* (1903), выканаў праект рэстаўрацыі *Віцебскай Ільінскай царквы*. Займаўся вывучэннем і кансервацыяй *Лідскага замка*. *А.А.Трусаў.*

СУ́СЛІКІ (Citellus), род грызуноў сям. вавёркавых. Вядомы з міяцэну (каля 10—5 млн. г. назад). 36 відаў. Пашыраны ў Еўразіі і Паўн. Амерыцы. Насяляюць лугі, стэпы, лесастэпы, пустыні і інш. Жывуць у норах. На зіму ўпадаюць у спячку. Многія віды — пераносчыкі і носьбіты ўзбуджальнікаў чумы і інш. На Беларусі (пераважна ў паўд. ч.) трапляецца С. рабы (C. suslicus). У выкапнёвым стане ў Чачэрскім р-не знойдзены рэшткі С. вял. (C. major), інш. відаў — у Віцебскім і Гродзенскім р-нах.

Даўж. цела да 40 см, хваста да 25 см. Афарбоўка ад пясчана-вохрыстай да буравата-шэрай. Вушныя ракавіны малыя. Ногі кароткія. Расліннаедныя. Нараджаюць да 17 дзіцянят. Аб'ект промыслу. *Э.Р.Самусенка.*



Суслікі: 1 — шэры; 2 — рабы.

СУСПЕ́НЗІІ (ад лац. suspensio падвешванне), з а в і с і, дысперсныя сістэмы, у якіх часцінкі цвёрдай дысперснай фазы знаходзяцца ў завіслым стане ў вадкім дысперсійным асяроддзі; грубадысперсныя сістэмы з памерамі часцінак дысперснай фазы большымі за 10^{-6} м.

Неструктураваныя С. седыментацыйна няўстойлівыя; часцінкі дысперснай фазы асядаюць пад дзеяннем сілы цяжару (гл. *Седыментацыя*); з прычыны значных памераў практычна не ўдзельнічаюць у броўнаўскім руху і дыфузіі (гл. *Золі*). Атрымліваюць С. змешваннем сухіх парашкоў з вадкасцю, *дыспергаваннем* цвёрдых цел у вадкасці, выдаленнем цвёрдай фазы ў вадкім асяроддзі (метады кандэнсацыі; напр., утварэнне С. пры ахаладжэнні перасычаных растворaў). Тыповыя С. — *пульпа*, *эмалевыя фарбы*, цэментныя растворы. У прыродных умовах С. ўтвараюцца пры размыванні глебы і грунтоў вадой, у выніку выветрывання і вылугоўвання, пры забруджванні вадаёмаў атм. пылам. Выкарыстоўваюць С. ў хім., цэментавай, сілікатнай, папяровай, тэкст., харч. і інш. галінах прам-сці.

СУ́СТАВА Наталля Уладзіміраўна (н. 30.4.1951, г. Хемніцы, Германія), бел. мастак. Скончыла Горкаўскае маст. вучылішча (Расія; 1971), Маскоўскі паліграф. ін-т (1976). Працуе ў галіне кніжнай графікі, пераважна афармляе і ілюструе кнігі для дзяцей: «Рамоначак — Рамунеле» (1979), «Залаты птах» (1982); «Айбаліць» К.Чукоўскага, «Аёга» (абедзве 1984), «Сакрэт шчасця» (1988), «Залатая какавінка» (1989); «Чараўнік Ізумруднага горада» (1988), «Урфін Джус» (1989), «Сем падземных каралёў» (1990), «Жоўты туман» (1994) А.Волкава; «Як браты бацькаў скарб знайшлі» (1994), «Залатая кніга казак» Б.Немцавай (1996), «Папялушка» М.Маляўкі (2000) і інш. Творы вылучаюцца своеасаблівасцю маст. вырашэння: тонкае адчуванне колеру, мяккасць, лірычнасць.

СУСТА́ВЫ, д ы а р т р о з ы, с і н а в і я л ь н ы я з л у ч э н н і, с у ч л я н е н н і, рухомыя злучэнні касцей шкілета пазваночных жывёл і чалавека, з дапамогай якіх ажыццяўляюцца розныя рухі. Іх сустаўныя паверхні раздзяляюцца сустаўнай поласцю, што ўтрымлівае *сінавіяльную вадкасць*. Падзяляюцца на простыя, складаныя, комплексныя, камбінаваныя (у залежнасці ад колькасці сустаўных паверхняў). Паводле характару рухаў адрозніваюць аднаосевыя С., у якіх рух адбываецца вакол адной восі, двух-, трох- і шматосевыя. Сучляненні касцей падзяляюць на 2 асн. групы: бесперарывістыя і перарывістыя. Ступені свабоды С. абмяжоўваюцца яго формай, выступамі касцей, нацяжэннем сустаўнай сумкі і звязак. Звязкі ўмацоўваюць С., накіроўваюць у іх рух. Паверхні касцей у С. укрыты сустаўнымі храсткамі (амартызуюць штуршкі пры руху, робяць рух эластычным), абкружаны сустаўнай сумкай, якая герметычна замыкае поласць С. і мае невял. колькасць сінавіяльнай вадкасці. Пашкоджанні С. — *артрыты*, *артрозы*, *вывіхі* і інш.

Літ.: Павлова В.Н. Синовиальная среда суставов. М., 1980. *А.С.Леанцюк.*

СУСТРЭ́ЧНЫ БОЙ, від баявых дзеянняў падраздзяленняў, часцей, злучэнняў, калі абодва бакі вырашаюць пастаўленыя задачы *наступленнем*. Можа ўзнікнуць пры сустрэчы з праціўнікам на маршы; у наступленні — пры адбіцці *атак*, контрудараў і інш.; у *абароне* — пры ажыццяўленні *контратак* і контрудараў, пры дзеяннях супраць паветр. і марскіх дэсантаў. С.б. характарызуецца няяснасцю становішча, хуткацечнасцю і рашучасцю дзеянняў бакоў. Умовамі яго поспеху з'яўляюцца бесперапынная разведка, своечасовае прыняцце рашэнняў, імгненнае давядзенне задач да войск, апярэджанне праціўніка ў манеўры, адкрыцці агню і інш. С.б. можа перарасці ў абарончы бой, адыход, *праследаванне*, а таксама ў сустрэчную бітву аператыўных аб'яднанняў.

СУСТРЭ́ЧНЫ ІСК, самастойнае іскавае патрабаванне адказчыка да істца, якое заяўлена ў судзе або арбітражы ў час разбору для сумеснага разгляду з першапачатковым іскам. З'яўляецца сродкам абароны адказчыка супраць прад'яўленага яму іску. С.і. незалежна ад яго падсуднасці прад'яўляецца ў судзе, які разглядае першапачатковы іск, з выкананнем агульных правіл іскавага судаводства.

СУСЬКО́ Якаў Ягоравіч (н. 17.3.1917, в. Чарняўка Хоцімскага р-на Магілёўскай вобл.), Герой Сав. Саюза (1945). Скончыў Чкалаўскае ваен. авіявучылішча (1941), варонежскія абл. партшколу і пед. ін-т (1949), Вышэйшую дыпламат. школу (1952). У Чырв. Арміі з 1937. У Вял. Айч. вайну з 1943 на Зах., Бранскім, 1-м і 4-м Укр. франтах, удзельнік Арлоўскай і Курскай бітваў, вызвалення Украіны, Венгрыі, Польшчы, Чэхаславакіі. Камандзір эскадрыллі штурмавога авіяпалка капітан С. зрабіў 141 баявы вылет, прычыніў праціўніку значныя страты ў баявой тэхніцы. Да 1946 у Сав. Арміі, да 1978 на дыпламат. рабоце.

СУТА́НА (франц. soutane ад італьян. sottana спадніца, раса), доўгае суцэльнае адзенне з вузкімі рукавамі, якое зашпільваецца частым радам гузікаў і носіцца каталіцкім духавенствам у прыватным жыцці і ў царкве (пад убраннем для набажэнстваў). С. бывае рознага колеру ў залежнасці ад рангу асобы: белая ў папы, чырвоная ў кардыналаў, фіялетавая ў біскупаў, чорная ў радавога духавенства.

СУ́ТАРГІ, неадвольныя прыступападобныя скарачэнні шкілетных або гладкіх мышцаў. Абумоўлены празмерным раздражненнем ц.н.с. Узнікаюць пры пашкоджаннях мозга (траўмы, пухліны і інш.), інфекцыях (*слупняк*), інтаксікацыях і інш. Бываюць эпізадычныя і пастаянныя, лакальныя, генералізаваныя, кланічныя (хуткія перыяд. скарачэнні і расслабленні асобных мышцаў), танічныя (павольныя доўгія з «застываннем» тулава і канечнасцей у вымушаных позах), мяшаныя. Лакальныя танічныя С., напр., у ікраножных мышцах, суправаджаюцца рэзкім болем; С. дыяфрагмы — ікотай і інш. Лячэнне тэрапеўт., хірургічнае. Гл. таксама *Руху парушэнні*. *І.М.Семяненя.*



Я.Я.Сусько.

СУТКАВЕ́ЦКАЯ ЦАРКВА́-КРЭ́ПАСЦЬ, Суткавецкая Пакроўская царква, помнік украінскай архітэктуры 15—16 ст. у с. Суткаўцы Хмяльніцкай вобл. Пабудавана ў 1476. 2-павярховая, крыжападобная ў плане. Да цэнтр. квадратнага аб'ёму прымыкаюць 4 магутныя апсіды ў выглядзе вежаў з байніцамі. Захаваліся фрэскі 16 ст. і размалёўкі 1909.

СУ́ТКІ, адзінка часу, роўная 24 гадз. Адрозніваюць зорныя С., роўныя перыяду абарачэння Зямлі вакол сваёй восі адносна пункта вясенняга *раўнадзенства*, і сонечныя С. — перыяд абарачэння Зямлі адносна Сонца.

Зорныя С. роўныя прамежку часу паміж 2 паслядоўнымі верхнімі (ці ніжнімі) кульмінацыямі пункта вясенняга раўнадзенства. У залежнасці ад выбару пункта вясенняга раўнадзенства (сапраўдны — разглядаецца рух гэтага пункта з улікам *прэцэсіі* і *нутацыі*, сярэдні — улічваецца толькі прэцэсія) адрозніваюць сапраўдныя (іх працягласць непастаянная і бесперапынна мяняецца з-за нутацыі) і сярэднія зорныя С. (на 0,0084 с карацейшыя за сапраўдны перыяд абарачэння Зямлі). Сонечныя С. роўныя прамежку часу паміж 2 паслядоўнымі верхнімі (ці ніжнімі) кульмінацыямі Сонца. З прычыны эклiптычнасці зямной арбіты і нахілу *эклiптыкі* да экватара прамежак часу паміж 2 кульмінацыямі рэальнага Сонца — працягласць сапраўдных сонечных С. — мяняецца на працягу года ад 24 гадз 3 мін 36 с (у сярэдзіне вер.) да 24 гадз 4 мін 27 с (у канцы снеж.) зорнага часу. На практыцы карыстаюцца сярэдняй працягласцю сонечных С. за год — сярэднімі сонечнымі С., роўнымі 24 гадз 3 мін 56,55536 с зорнага часу. Гл. таксама *Каляндар*. *Л.М.Шахлевіч.*

СУ́ТНАСЦЬ І З'Я́ВА, філасофскія катэгорыі, якія адлюстроўваюць дыялектычна ўзаемазвязаныя, агульныя і неабходныя бакі ўсіх прадметаў і працэсаў *аб'ектыўнай рэальнасці*. Сутнасць уяўляе сабой сукупнасць глыбінных, заканамерных, адносна ўстойлівых унутр. сувязей пэўнага прадмета, якія аб'ядноўваюць у адзінае цэлае яго істотныя рысы і тэндэнцыі развіцця, увасабляе якасную акрэсленасць пэўнай з'явы ці працэсу. З'ява служыць формай выяўлення сутнасці ў канкрэтных падзеях, знешніх уласцівасцях прадмета, якія даступны эмпірычнаму пазнанню, нясе ў сабе частковую, няпоўную інфармацыю пра законы, што фарміруюць сутнасць. Паняцці С. і з. цесна звязаны; аб'ектыўная сувязь паміж імі мае характар *супярэчнасці дыялектычнай*, калі адзін з бакоў пэўнага прадмета абумоўлівае існаванне інш. боку. Працэс *пазнання* чалавекам навакольнага асяроддзя ўяўляе сабой працэс пераходу *мыслення* ад разнастайнасці наяўных форм прадмета (з'явa) да іх унутр. зместу і адзінства (сутнасць).

У гісторыі філасофіі да разумення прыроды С. і з. існавалі розныя падыходы. У ант. філасофіі сутнасць разглядалася як крыніца існавання рэчаў, а з'ява — як бачны ілюзорны вобраз рэчаў. У сярэдневяковай філасофіі С. і з. рэзка супрацьпастаўляліся як божая (сапраўдная) рэальнасць і ілюзорнае зямное існаванне. І.Кант разумеў пад сутнасцю непазнавальную «рэч у сабе», а з'яву лічыў суб'ектыўным уяўленнем чалавека. Як дыялектычна звязаныя катэгорыі С. і з. разглядаў Гегель. У неапазітывізме абвяргаецца аб'ектыўнасць сутнасці і прызнаюцца рэальнымі толькі з'явы, у постпазітывізме сутнасць тлумачыцца як тэарэт. канструкт, неабходны для сістэматызацыі фактаў. У фенаменалогіі з'явы разглядаюцца як самавыяўляльнае быццё, а сутнасць — як ідэальнае ўтварэнне. У экзістэнцыялізме катэгорыя сутнасці выцясняецца панящем існавання (гл. *Сутнасць і існаванне*). *В.І.Боўш.*

СУ́ТНАСЦЬ І ІСНАВА́ННЕ, паняцці ў *дыялектыцы*, якія характарызуюць узаемаадносіны паміж унутр. зместам прадмета, яго якаснай акрэсленасцю і разнастайнасцю зменлівых прадметаў. Паняцце сутнасці характарызуе сукупнасць глыбінных, заканамерных, адносна ўстойлівых унутр. сувязей прадмета, цэласнае адзінства яго істотных рыс і тэндэнцый развіцця. Паняцце існавання сінанімічна *быццю* прадметаў і характарызуе знешняе выяўленне прадметаў і з'яў, іх колькасную разнастайнасць, зменлівасць і выпадковасць. У гісторыі філасофіі існавалі розныя падыходы да гэтай праблемы. Абсалютызацыя ролі сутнасці характэрна для філасофіі Платона і яго паслядоўнікаў, а таксама для ўсіх філас. вучэнняў, якія прызнаюць аб'ектыўнае існаванне абсалютнага духу. У англ. эмпірызме 17—18 ст. Дж. Лок, Д.Юм) адстойвалася думка пра аб'ектыўнае існаванне толькі адзінкавых фактаў, якія фіксуюцца пачуццёвым вопытам — крыніцай усіх ведаў. Рацыяналізм новага часу (Р.Дэкарт, Б.Спіноза, Г.Гегель) у выніку развіцця матэматыкі і прыродазнаўства выходзіў з вучэння пра тоеснасць быцця і мыслення і лічыў, што існаванне мае рацыянальную, разумную аснову. Са спробай прымірэння супрацьлеглых поглядаў на праблему С. і і. выступалі Г.Лейбніц і І.Кант. Ірацыянальную трактоўку С. і і. прапанаваў С.К'еркегор, які паставіў у цэнтр філасофіі праблему існавання чалавека і яго шляху да асэнсавання рэліг. значэння свайго

жыцця. Погляды К'еркегора развіваліся ў *экзістэнцыялізме*, дзе цэнтр. месца належыць праблеме існавання чалавека (Л.Шастоў, К.Ясперс, Ж.П.Сартр і інш.). *В.І.Боўш.*

СУТУ́РЫН Анатоль Канстанцінавіч (н. 29.5.1948, в. Дзеранкавец Корсунь-Шаўчэнкаўскага р-на Чаркаскай вобл., Украіна), бел. вучоны ў галіне тэхн. кібернетыкі і інфарматыкі. Канд. тэхн. н. (1987). Скончыў БДУ (1971). У 1971—94 у Ін-це тэхн. кібернетыкі Нац. АН Беларусі. З 1996 у Бел. ін-це сістэмнага аналізу і інфарм. забеспячэння навук.-тэхн. сферы (з 2000 дырэктар). Навук. працы па аўтаматызацыі праектавання аб'ектаў складанай геам. формы, праграмным забеспячэнні сістэм аўтаматызаванага праектавання. Дзяржаўная прэмія СССР 1985.

Тв.: Аксиоматическое определение одного класса списковых структур данных // Весці АН БССР. Сер. фіз.-тэхніч. навук. 1980. № 2. *М.П.Савік.*

СУТЫКНЕ́ННІ А́ТАМНЫЯ, элементарныя акты ўзаемадзеяння паміж часціцамі (атамамі, малекуламі, іонамі ці інш.), пры якіх структура і будова атамных ядраў не змяняюцца. Бываюць пругкія і няпругія.

Пры п р у г к і х С.а. сумарная *кінетычная энергія* часціц застаецца пастаяннай — яна толькі перараэмяркоўваецца паміж часціцамі, а напрамкі руху часціц змяняюцца. Такія ўзаемадзеянні выклікаюць *пераносу з'явы* ў газах ці слабаіанізаваным плазме. Каэфіцыенты дыфузіі (перанос часціц), вязкасці (перанос імпульсу), цеплаправоднасці (перанос энергіі) і інш. выражаюцца праз эфектыўнае сячэнне рассеяння атамаў ці малекул (газакінетычнае сячэнне), напр., у газе. Пры н я п р у г к і х С.а. змяняецца *ўнутраная энергія* ўзаемадзейных часціц і адпаведна іх поўная кінетычная энергія. Пры гэтым змяняецца электронны стан атама, а таксама вагальны ці вярчальны стан малекулы. Імі абумоўлены іанізацыя атамаў, працэсы ў газавых лазерах, хім. рэакцыі і інш. *А.А.Богуш.*

СУТЭНЁРСТВА (ад франц. souteneur), з в о д н і ц т в а, карыслівае пасрэдніцтва паміж мужчынам і жанчынай для садзейнічання ўступленню іх у палюбоўную (палавую) сувязь. У многіх краінах С. — крымінальна-каральнае дзеянне. Паводле крымін. заканадаўства Рэспублікі Беларусь С. — адно са злачынстваў, якое выяўляецца ў арганізацыі ці ўтрыманні прытона для заняцця *прастытуцыяй*, або зводніцтва з карыслівай мэтай. Караецца штрафам, арыштам, абмежаваннем свабоды на пэўны тэрмін або пазбаўленнем волі на тэрмін да 5 гадоў.

СУФАНУВО́НГ (13.7.1909, г. Луангпрабанг, Лаос — студз. 1995), лаоскі паліт. і дзярж. дзеяч. Чл. каралеўскай сям'і Лаоса, стрыечны брат *Сувана Фумы*. Атрымаў адукацыю ў Францыі, інжынер-будаўнік. Удзельнік антыяп. і антыфранц. нац.-вызв. руху 1940 — пач. 1950-х г. З 1950 старшыня Адзінага патрыят. фронту Лаоса (з 1956 Патрыят. фронт Лаоса, ПФЛ), які да 1973 вёў узбр. барацьбу супраць цэнтр. ўрада Лаоса (за выключэннем 1956—57 і 1962—63, калі С. быў чл. кааліцыйнага ўрада Лаоса). У 1974—75 старшыня Нац. паліт. кааліцыйнага савета Лаоса. У 1975—86 прэзідэнт Лаоскай Нар.-Дэмакр. Рэспублікі.

СУФІ́ЗМ (ад араб. суфі літар. — які носіць шарсцяное адзенне ці ад грэч. sophos мудрэц), містычная плынь у *ісламе* (*шыізме* і *сунізме*), пашыраная на тэр. ад паўн.-зах. Афрыкі да Індыі і Кітая. Зарадзіўся ў 8 ст., канчаткова афарміўся ў 10 ст. Асновы вучэння С. закладзены ў 9 ст. егіпцянінам Зу-л-Нунам аль-Місры і заснавальнікам багдадскай школы С. Абу Абдалахам аль-Мухасібі. У 10—11 ст. складваліся арг-цыі суфійскіх ордэнаў, ствараліся суфійскія манастыры (ханаках). Да 11—12 ст. С. праследаваўся артадаксальным мусульм. духавенствам як ерась. З распаўсюджваннем С. ў 12—14 ст. склаліся 12 асн. суфійскіх брацтваў: рыфаія, ясавія, шазілія, чышція, сухравардзія, кубравія, бадавія, кадзірыя, маўлавія, бекташыя, халвацыя, накшбандзія-хваджаган. У развіцці С. адзначаецца ўплыў філасофіі хрысціянства, веданты, будызму, індуізму і інш. У цэнтры С. — вучэнне пра несапраўднасць быцця матэрыяльнага свету, расчлянёнага «цэпам множнасці». Свёй мэтай суфіі лічылі пазбаўленне залежнасці ад матэрыі і містычнае растварэнне ў Богу (фана), дасягненне «звышбыцця» (бака) праз аскетызм, адмаўленне ад асабістай індывідуальнасці, ірацыянальнае пазнанне Абсалюту. Шлях да Абсалюту, паводле С., уключае шэраг этапаў: шарыят (строгае прытрымліванне ісламскіх прадпісанняў), тарыкат (аскеза і паслушніцтва ў старца-настаўніка), марыфат (усведамленне адзінства сябе і Бога) і хакыкат (непасрэднае адзінства з Богам). С. — неаднародная мусульм. плынь, да якой далучыліся прадстаўнікі розных багаслоўскіх школ ісламу. У 11—20 ст. С. уяўляў сабой паліт. сілу мусульм. свету, значна паўплываў на развіццё ісламу і ўсх. культуры. Вучэнне С. адлюстравана ў араб., перс. і тур. паэзіі (Ібн аль-Фарыд, Дж.Румі, Джамі, Юнус Эмрэ і інш.).

Літ.: С т е п а н я н ц М.Т. Философские аспекты суфизма. М., 1987; Из истории суфизма: источники и социальная практика. Ташкент, 1991; М у х а м м е д х о д ж а е в А. Гносеология суфизма. Душанбе, 1990; Н у р б а х ш Дж. Психология суфизма: Дел Ва Нафс: (Сердце и душа): Размышления о стадиях психол. становления и развития на суфийском пути: Пер. с англ. М., 1996. *Н.Г.Кісялёва.*

СУ́ФІЙ, мусульманскі аскет і містык, прыхільнік *суфізму*. Атрыбут С. — грубае шарсцяное адзенне.

СУ́ФІКС (ад лац. suffixus прымацаваны), службовая *марфема*, якая размяшчаецца непасрэдна за коранем слова або пасля інш. С.; адзін з відаў *афікса*. Служыць для ўтварэння новых слоў або іх несінтакс. форм (у адрозненне ад канчатка). Паводле функцый С. падзяляюць на словаўтваральныя («бел-ы — бял-ізн-а», «аўтар — аўтар-ств-а»), формаўтваральныя («смел-а — смял-ей», «ляж-аць — леж-ач-ы») і С. суб'ектыўнай ацэнкі, або словаформаўтваральныя («слуп — слуп-ок, слуп-очак», «мал-ы — мал-еньк-і»). Паводле структуры адрозніваюць С. простыя («нов-ыя — нав-ін-а», «мов-а — моў-н-ы», «грук-аць — грук-ат») і састаўныя («мудр-ы — мудр-агелісты» з «мудр-аг-ел-іст-ы»). Асобны від С. — т.зв. с у ф і к с о і д ы, г.зн. каранёвыя марфемы («-вар», «-вод», «-коп», «-мер», «-ход» і інш.), якія ўжываюцца ў функцыі С.: «пешаход», «справавод», «дальнамер». *А.Я.Міхневіч.*

СУФЛЁР (ад франц. souffler дзьмуць, падказваць), работнік т-ра, які сочыць за ходам рэпетыцыі і спектакля па тэксце п'есы (суфлёрскі экзэмпляр) і пры неабходнасці падказвае акцёрам тэкст ролі (у муз. т-ры С. сочыць па клавіры). Знаходзіцца ў суфлёрскай будцы, размешчанай каля лініі заслоны (ці ў адной з бакавых куліс) і схаванай ад гледачоў.

СУФЛО́ (Soufflot) Жан Жэрмэн (22.7.1713, Ірансі, каля г. Асер, Францыя — 29.8.1780), французскі архітэктар; прадстаўнік класіцызму. Вучыўся ў Рыме (1734—37). З 1731 і ў 1750 вывучаў ант. помнікі Італіі і М.Азіі. Паводле яго праектаў узведзены фасад атэля Дзьё (бальніца; 1741—42) у Ліёне і інш. пабудовы. Асн. яго твор — царква Сент-Жэнеўеў у Парыжы (1755—89, у 1791 пераўтворана ў Пантэон), вылучаецца строгай манументальнасцю форм, смеласцю канстр. вырашэнняў. Іл. гл. да арт. *Пантэон*.

СУФО́ЗІЯ (ад лац. suffossio падкопванне, падрыванне), вышчалочванне і вынас дробных мінеральных часцінак грунтавымі водамі, якія фільтруюцца ў тоўшчы горных парод. Можа праяўляцца адначасова з *карстам*. Выклікае ўтварэнне падземных пустот і прасадку асадкавых тоўшчаў. На паверхні фарміруюцца замкнёныя паніжэнні (варонкі, *стэпавыя сподкі*). С. спрыяе залажэнню паверхневага часовага, а потым і пастаяннага сцёку з развіццём яроў або рачных далін. На Беларусі С. праяўляецца ў раёнах пашырэння *лёсападобных парод*, пераважна на Аршанска-Магілёўскай раўніне.

СУФРАЖЫ́СТКІ (ад англ. suffrage выбарчае права), удзельніцы руху за жаночае выбарчае права ў Зах. Еўропе і ЗША ў 2-й пал. 19 — пач. 20 ст. Пачатак руху С. пакладзены жаночай канферэнцыяй у г. Сенека-Фолс (ЗША) у 1848. У 1869 у ЗША створаны Амер. і Нац. жаночыя суфражысцкія асацыяцыі, якія ў 1890 аб'ядналіся ў Амер. нац. жаночую суфражысцкую асацыяцыю. Рух С. Вялікабрытаніі ўзначалілі Жаночая ліга свабоды і створаны ў 1903 Жаночы сац.-паліт. саюз. С. арганізоўвалі грамадскія акцыі з мэтай прыцягнуць увагу грамадства да праблемы вы-

барчага права для жанчын. Суполкі С. узніклі і ў інш. краінах Зах. Еўропы. Калі ў 1920-я г. ў б.ч. еўрап. краін жанчыны атрымалі выбарчыя правы, удзельніцы руху С. пераключыліся на барацьбу за сапраўднае раўнапраўе жанчын.

Літ.: Новикова Н.В. Суфражистки и суфражетки: идеология и политика британ. феминист. движения в начале XX в. // Женщины в истории: возможность быть увиденными. Мн., 2001. Вып. 1.



Дз.Г.**Сухавараў**.



А.В.**Сухаво-Кабылін**.

СУХАВА́РАЎ Дзмітрый Гаўрылавіч (12.6.1904, в. Жакаўка Дрыбінскага р-на Магілёўскай вобл. — 4.3.1983), Герой Сав. Саюза (1944). Скончыў Кіеўскае пях. вучылішча (1931), курсы ўдасканалення каманднага саставу пры Ваен. акадэміі Генштаба (1935), Ваенна-паліт. акадэмію (1941). У Чырв. Арміі з 1926. Удзельнік паходу Чырв. Арміі ў Зах. Украіну восенню 1939. У Вял. Айч. вайну з 1941 на Паўн.-Зах., Зах., Сталінградскім, Варонежскім, Сцяпным, 1-м Укр., Далёкаўсх. франтах. Танк. полк на чале з падпалкоўнікам С. вызначыўся 5.11.1943 у баях за вызваленне Кіева. Удзельнік вайны з Японіяй 1945. Да 1957 у Сав. Арміі, да 1965 на адм. рабоце.

СУХАВЕ́Й, гарачы і сухі вецер, характэрны для надвор'я антыцыкланальнага тыпу; адзначаецца пераважна ў стэпах, паўпустынях і пустынях. Часцей назіраецца летам на перыферыі антыцыклону. Скорасць ветру 5—20 м/с, т-ра паветра 20—25 °С, адносная вільготнасць менш за 30%, працягваецца звычайна некалькі сутак. Можа выклікаць *засуху*. Характэрны для Сярэдняй Азіі, Прыкаспійскай нізіны. У інш. рэгіёнах падобныя вятры наз. *хамсін*, *сірока*, *харматан*.

СУХАВЕ́РХАВА Наталля Уладзіміраўна (н. 3.11.1949, Мінск), бел. мастак дэкар.-прыкладнога мастацтва. Дачка У.П.*Сухаверхава*. Скончыла Бел. тэатр.-маст. ін-т (1971). З 1971 на Мінскім маст. камбінаце, з 1996 адначасова займаецца выкладчыцкай дзейнасцю. Сярод твораў габелены: «Квітнеючы мой край» для Палаца культуры калгаса «Нёман» Стаўбцоўскага р-на (1986), «Беларусь» для рэстарана «Беларусь» у Мінску (1987), «Купалле» для Палаца культуры ў в. Крупіца Мінскага р-на (1989), «Вясновы» і «Сонечны» для ўрадавай рэзідэнцыі ў г. Заслаўе (1995), а таксама «Сон-трава» (1976), «Восень» (1978), «Зачараваны край» (1981), «Сонечная сюіта», «Цвіценне» (абодва 1982), «Варажба на кававай гушчы», «Дарога» (абодва 1991), «Летнія навальніцы» (1996), «Успамін» (2001). Творы вызначаюцца рытмічнасцю кампазіцыі, гарманічнасцю колеравых суадносін, стрыманасцю каларыту і падкрэсленай дэкаратыўнасцю.

СУХАВЕ́РХАЎ Уладзімір Паўлавіч (3.12.1908, г. Днепрапятроўск, Украіна — 4.5.1977), бел. жывапісец, педагог. Засл. дз. маст. Беларусі (1955). Скончыў Віцебскі маст. тэхнікум (1930), Маскоўскі ін-т імя В.Сурыкава (1946). З 1947 выкладаў у Мінскім маст. вучылішчы, з 1954 — у Бел. тэатр.-маст. ін-це. У 1954—56 старшыня праўлення Саюза мастакоў Беларусі. Працаваў у розных жанрах станковага жывапісу. Тэме гераізму ў Вял. Айч. вайну прысвечаны карціны «Сустрэча партызан з Савецкай Арміяй» (1946), «За родную Беларусь!» (1948); мірнай стваральнай працы — «Пераможам у працы» (1950), «Трактары ідуць» (1967). Выканаў партрэты ўдзельнікаў партыз. руху на Беларусі (1942—44), перадавікоў працы Мінскага трактарнага з-да К.В.Курчыцкай (1952), У.П.Шышко (1965), Я.І.Клімчанкі (1969); мастачкі С.Лі (1946) і інш. Малюе пейзажы: «Зіма» (1944), «Свіслач» (1945), «Зімовы вечар» (1948), «Дубцы» (1953), нацюрморты.

Г.М.Ярмоленка.

СУХАВО́-КАБЫ́ЛІН Аляксандр Васілевіч (29.9.1817, Масква — 24.3.1903), рускі драматург. Акад. Пецярбургскай АН (з 1902). Скончыў Маскоўскі ун-т (1838). У 1838—40 вывучаў філасофію ў германскіх ун-тах. У драматург. трылогіі «Карціны мінулага» (як трылогія паст. ў 1917 У.Меерхольдам у Александрынскім т-ры): камедыя «Вяселле Крачынскага» (нап. 1854, паст. 1855, Малы т-р), драма «Справа» (нап. 1861, паст. 1882), камедыя-жарт «Смерць Тарэлкіна» (нап. 1869, паст. 1900) паказаў тагачасныя норавы, уседазволенасць і бюракратызм судовых чыноўнікаў і паліцыі, трагічную залежнасць чалавека ад іх улады. Займаўся філасофіяй (аўтар уласнай «філасофіі Усясвету»), перакладаў творы Гегеля. Яго п'есы карысталіся папулярнасцю на Беларусі. П'есу «Вяселле Крачынскага» ставілі Дзярж. рус. драм. т-р (1933), Бел. т-р імя Я.Коласа (1949, 1981), «Смерць Тарэлкіна» — Дзярж. рус. драм. т-р (1954), Магілёўскі абл. драм. т-р (1989), Нац. т-р імя Я.Купалы (1996, пад назвай «Смерць Кандзіда Тарэлкіна») і інш.

Тв.: Трилогия. М., 1966.

Літ.: Бессараб М.Я. Сухово-Кобылин. М., 1981.

СУХАГРУ́ЗНАЕ СУ́ДНА, грузавое *судна* для перавозкі сухіх грузаў і вадкіх у тары. Адрозніваюць С.с. для штучных грузаў (перавозяць іх у стосах, пачках, цюках, бочках, скрынях) і навалачных грузаў (навалам і насыпам).

Да С.с. адносяцца *рэфрыжэратары*, *лесавозы*, грузавыя *паромы*, *ліхтэравозы*, кантэйнерныя судны і інш. Бываюць самаходныя і несамаходныя. Грузы на С.с. размяшчаюцца ў трумах, твіндэках і дыптанках, штучныя грузы — на верхняй палубе. Пагрузка-выгрузка робіцца праз грузавыя люкі верхняй палубы або праз бартавыя, насавыя і кармавыя адтуліны. Грузападымальнасць марскіх С.с. да 200 тыс. т, рачных да 8 тыс. т.



У.**Сухаверхаў**. За родную Беларусь! 1948.

СУХАДО́ЛЬСКІ Януар Іванавіч (19.9.1797, г. Гродна — 20.3.1875), бел. жывапісец-баталіст. Творчасць звязана з маст. жыццём Беларусі, Польшчы і Расіі. Жывапісу вучыўся ў Варшаве ў А.Брадоўскага (з 1815), у Рыме ў К.Вернэ (1832—37). Удзельнік паўстання 1830—31. Стварыў рамант. карціны на гіст. тэматыку «Бітва пад Рашынам» (1832), «Бітва пад Самасьерай» (1860), «Пераход арміі Напалеона цераз Бярэзіну» (1866). Аўтар серыі батальных кампазіцый на тэму рус.-перс. і рус.-тур. войнаў, у якіх удзельнічаў сам: «Узяцце крэпасці Карс», «Узяцце Ачакава», «Штурм крэпасці Ахалцых», «Фельдмаршал Паскевіч прымае дэлегацыю жыхароў Эрзурума», «Асада крэпасці

Абасабад» і інш. Сярод інш. твораў: «Сцэна з 1831 года», «Заключэнне Туркманчайскага міру», «Паляванне на аленя», «Дзед з унукам на паляванні» і інш. У творчасці С. дакументальная дакладнасць адлюстравання спалучаецца з выдатна распрацаванай кампазіцыяй, яркай маляўнічасцю жывапісных вырашэнняў.

Літ.: Дробаў Л.М. Беларускія мастакі XIX ст. Мн., 1971; Ягож. Живопись Белоруссии XIX — начала XX в. Мн., 1974.

Л.Н.Дробаў.

СУХАДРО́ЎКА, Суходраўка, рака ў Лёзненскім і Віцебскім р-нах Віцебскай вобл., правы прыток р. Лучоса (бас. р. Зах. Дзвіна). У верхнім цячэнні наз. Вольша. Даўж. 66 км. Пл. вадазбору 519 км^2. Пачынаецца каля паўн.-ўсх. ускраіны в. Свірбы Лёзненскага р-на, вусце за 1 км на ПнЗ ад в. Кузьмянцы Віцебскага р-на. Цячэ ў межах Віцебскага ўзв. Даліна трапецападобная, шыр. 300—600 м, ёсць звужэнні да 50 м, ніжэй упадзення р. Ласасіна невыразная. Пойма чаргуецца па берагах, у верхнім цячэнні месцамі адсутнічае, пераважная шыр. 100—300 м. Рэчышча свабодна меандруе, сярэдне звілістае, у сярэднім цячэнні моцназвілістае, паміж вёскамі Стасева і Вял. Выдрэя Лёзненскага р-на парожыстае.



Я.Сухадольскі. Пераход арміі Напалеона цераз Бярэзіну. 1866.



Марское **сухагрузнае судна**: 1 — грабны вінт; 2 — руль; 3 — верхняя палуба; 4 — грузавая страла; 5 — дымавая труба; 6 — антэна радыёлакацыйнай станцыі; 7 — рулявая рубка; 8 — грузавы люк; 9 — фок-мачта; 10 — брашпіль; 11 — якар; 12 — пераборкі; 13 — насціл другога дна; 14 — другая палуба; 15 — днішчавы стрынгер; 16 — палубны набор; 17 — грузавы трум; 18 — дызель-генератар; 19 — галоўны рухавік; 20 — валапровад.



Сухагрузнае судна.

СУХАЖЫ́ЛЛЕ, шчыльнае, эластычнае ўтварэнне са злучальнай тканкі, з дапамогай якога шкілетныя мышцы прымацоўваюцца да касцей і рухаюць іх.

Мае форму шнура, стужкі ці пласцінкі. Вельмі моцнае (ахілава С. трохгаловай мышцы галёнкі вытрымлівае масу больш за 500 кг), садзейнічае макс. нацяжэнню мышцаў у месцах іх прымацавання. Ад празмернага расцяжэння С. (напр., пры траўме) адрываецца разам з касцявой тканкай.

СУХАЗАНЕ́ТЫ, расійскія ваен. дзеячы, браты. З дваран Віцебскай губ. Нарадзіліся ў в. Вясея Слуцкага р-на Мінскай вобл.

Іван Ануфрыевіч (22.7.1788—20.2.1861), ген. ад артылерыі (1839). Скончыў 2-і кадэцкі корпус (1803). Удзельнік рус.-пруска-франц. вайны 1806—07. У вайну 1812 камандаваў артыл. часцямі, удзельнічаў у баях каля Друі, *Клясціцкіх баях 1812*, *Полацкіх бітвах 1812*, *Чашніцкіх баях 1812*, *Бярэзінскай аперацыі 1812*, у замежных паходах 1813—14. З 1819 нач. артылерыі Гвардзейскага корпуса ў С.-Пецярбургу, у час паўстання дзекабрыстаў загадаў адкрыць агонь па карэ паўстанцаў (26.12.1825). Удзельнічаў у рус.-турэцкай вайне 1828—29. У час задушэння паўстання 1830—31 камандаваў артылерыяй арміі. У 1823—54 першы дырэктар Ваен. акадэміі (пазней акадэмія Генштаба). З 1833 чл. Ваеннага савета.

Мікалай Ануфрыевіч (1794—3.8.1871), ген. ад артылерыі (1852). У вайну 1812 удзельнічаў у баях каля Клясціц, на р. Сівошыне, Свольненскім баі, каля Полацка, Чашнікаў, Віцебска, Люцына, у замежных паходах 1813—14. У час задушэння паўстання 1830—31 дзейнічаў на тэр. Польшчы. У 1849—55 нач. артылерыі дзеючай арміі. У 1856—61 ваен. міністр, чл. Дзярж. савета. У маі—кастр. 1861 в.а. намесніка Царства Польскага. *Э.А.Карніловіч.*

СУХАЛЮ́БЫ, арганізмы сухіх месц, тое, што *ксерафілы*.

СУХАМЛІ́НАЎ Міхаіл Іванавіч (12.3.1828, г. Харкаў, Украіна — 21.7.1901), рускі філолаг і гісторык літаратуры. Акад. Пецярбургскай АН (1872). Скончыў Харкаўскі ун-т (1848). Д-р славяна-рус.

філалогіі (1856). З 1860 праф. Пецярбургскага ун-та. Выкарыстаў помнікі слав. пісьменнасці і л-ры як матэрыял для параўнальнага аналізу. Аўтар даследаванняў «Пра старажытны рускі летапіс як помнік літаратурны» (1856), «Пра творы Кірылы Тураўскага» (1858). Апублікаваў 20 «слоў» і прытчаў Кірылы Тураўскага, даследаваў яго паэт. майстэрства, стыль, маст. асаблівасці, высока ацэньваў яго ўклад у развіццё стараж.-рус. аратарскай прозы; выявіў у яго творчасці ўплывы Бібліі, Іаана Златавуста і фальклору, аднак перабольшваў залежнасць ад візант. л-ры. Выдаў «Матэрыялы для гісторыі імп. Акадэміі навук» (т. 1—10, 1885—1900), дзе сабрана больш за 8 тыс. архіўных дакументаў.

СУХАМЛІ́НСКІ Васіль Аляксандравіч (28.9.1918, с. Васільеўка Ануфрыеўскага р-на Кіраваградскай вобл., Украіна — 2.9.1970), украінскі педагог. Чл.-кар. АПН СССР (1957). Канд. пед. н. (1955). Засл. настаўнік Украіны (1958). Герой Сац. Працы (1968). Скончыў Палтаўскі пед. ін-т (1939). Выкладаў укр. мову і л-ру ў сельскіх школах Ануфрыеўскага р-на Кіраваградскай вобл. У 1944—48 заг. Ануфрыеўскага райана, з 1948 дырэктар Паўлышскай сярэдняй школы. Аўтар навук. прац па праблемах практычнай педагогікі (пытанні кіраўніцтва школай, прафес. майстэрства настаўніка, праблемы разумовага, маральнага, працоўнага, эстэт. і фіз. выхавання вучняў). Стварыў арыгінальную пед. сістэму, заснаваную на антрапал. падыходзе, гарманізацыі форм, сродкаў і метадаў пед. дзейнасці, прызнанні асобы дзіцяці вышэйшай каштоўнасцю працэсаў выхавання і адукацыі. Звяртаў увагу на ўзаемасувязь маральнага выхавання і навучання, развіццё эмацыянальнай успрымальнасці. Трактаваў выхаванне як працэс рэалізацыі прыроджаных якасцей дзіцяці і разам з тым вял. значэнне надаваў спецыяльна арганізаванаму выхаваўчаму соцыуму. Распрацоўваў прадукц. шляхі злучэння фіз. і разумовай працы школьнікаў на аснове доследнай, пошукавай дзейнасці. Паўлышская школа стала своеасаблівай навук. лабараторыяй, у якой увесь пед. калектыў удзельнічаў у шматгадовай доследна-эксперым. дзейнасці. З 1975 у ёй пед. музей С. Дзярж. прэмія Украіны 1974.

Тв.: Избр. пед. соч. Т. 1—3. М., 1979—81; Об умственном воспитании. Киев, 1983; Книга о любви. М., 1983; Хрестоматия по этике. М., 1990; Человеческая личность неповторима. Курск, 1991.

Літ.: Вітка В. «Сэрца аддаю дзецям»: Настаўнік // Вітка В. Выбр. творы. Мн., 1973. Т. 2; Богуславский М.В. Школа гражданственности и человечности. Кировоград, 1990; Родчанин Е.Г., Зязюн И.А. Гуманист. Мыслитель. Педагог: Об идеалах В.А.Сухомлинского. М., 1991; Мухин М.И. Гуманизм педагогики В.А.Сухомлинского. М., 1994.

СУ́ХАНА, рака ў Валагодскай вобл. Расіі, левая састаўляючая р. Паўн. Дзвіна. Даўж. 558 км, пл. бас. 50,3 тыс. км². Выцякае з воз. Кубенскае, сцёк з якога зарэгуляваны плацінай з суднаходным шлюзам. Цячэ пераважна па раўніннай мясцовасці. У верхнім цячэнні звілістая, у сярэднім парожыстая, шмат перакатаў. Асн. прытокі: Волагда, Лежа (справа), Уфцюга (злева). Ледастаў з канца кастр. — пач. ліст. да 2-й пал. крас. — 1-й пал. мая. Разводдзе з крас. да сярэдзіны ліпеня. Сярэдні расход вады каля в. Калікіна 442 м³/с. Суднаходная (летам бываюць перапынкі з-за малаводдзя). Сплаўная. Уваходзіць у *Паўночна-Дзвінскую водную сістэму*. На С. гарады Сокал, Тоцьма, Вялікі Усцюг. Турызм.



В.А.**Сухамлінскі**.



Э.**Сухань**.

СУХА́НАЎ Аляксандр Фёдаравіч (н. 29.10.1928, с. Саснова Далматаўскага р-на Курганскай вобл., Расія), бел. і рас. вучоны ў галіне гісталогіі. Д-р мед. н. (1974), праф. (1975). Скончыў Омскі мед. ін-т (1951). З 1956 у Кемераўскім мед. ін-це (з 1971 прарэктар). З 1978 у Віцебскім мед. ін-це (заг. кафедры, дэкан). Навук. працы па марфал. і гістахім. заканамернасцях рэакцыі арганізма на антыгенны раздражняльнік, пытаннях структурна-функцыян. пашкоджанняў і рэгенерацыі клетак, тканак пры зменены тэмпературным гамеастазе (гіпатэрміі) арганізма.

Тв.: Изменения активности ферментов энергетического обмена эпидермиса белых крыс разного возраста при общей глубокой гипотермии и в посттипотермическом периоде (разам з А.Д.Мядзельцам) // Криобиология. 1987. № 2.

СУ́ХАНЬ (Suchoň) Эўген (25.9.1908, г. Пезінак, Славакія — 1993), славацкі кампазітар, адзін з заснавальнікаў сучаснай славацкай музыкі. Нар. арт. Чэхаславакіі (1958). Вучань В.*Новака*. З 1933 выкладаў у Муз.-драм. акадэміі (з 1941 кансерваторыя), у 1948—74 ва ун-це, адначасова ў 1954—59 у пед. ін-це ў Браціславе. Для твораў характэрна арганічнае спалучэнне нар. муз. традыцыі з навейшай кампазітарскай тэхнікай; оперы «Водаварот» (паст. 1949), «Святаплук» (паст. 1959), кантата «Псалом зямлі Падкарпацкай» (1938), арк. творы, хоры і інш. Аўтар муз.-тэарэт. прац. Дзярж. прэміі Чэхаславакіі 1951, 1954, 1973.

СУХАПУ́ТНЫЯ ВО́ЙСКІ, від узброеных сіл, прызначаны для вядзення баявых дзеянняў на сушы. У большасці дзяржаў, у т.л. ў Рэспубліцы Беларусь, С.в. з'яўляюцца найб. шматлікім, разнастайным па ўзбраенні і спосабах баявых дзеянняў відам узбр. сіл.

У стараж. часы С.в. складаліся з *пяхоты* і *кавалерыі*. Значнае развіццё С.в. атрымалі ў Стараж. Рыме (створаны *легіёны*, *маніпулы*, *цэнтурыі*, *кагорты* і інш.). У 8—14 ст. у краінах Еўропы гал. родам С.в. была конніца (гл. *Рыцарскае войска*). З 14 ст. ўзрастала роля пяхоты як асн. роду С.в., з'явілася *артылерыя*. У 17 — пач. 18 ст. ў большасці еўрап. дзяржаў створаны інж. часці і злучэнні, у т.л. ў ВКЛ Корпус інжынераў (1789), у сярэдзіне 19 ст. — *войскі сувязі*. У 1-ю сусв. вайну С.в. складалі асн. масу ўзбр. сіл еўрап. краін; яны мелі на ўзбраенні магазінныя вінтоўкі са штыком, станковыя і ручныя кулямёты, скарастрэльныя гарматы, мінамёты, бронеаўтамабілі, з 1916 — танкі (гл. *Танкавыя войскі*) і інш. Войскі былі аб'яднаны ў арміі, у склад якіх уваходзілі карпусы і дывізіі. У канцы вайны С.в. папоўніліся бранятанкавымі, хім., аўтамабільнымі войскамі і *войскамі процілаветранай абароны*. У 2-ю сусв. вайну С.в. колькасна пераўзыходзілі інш. віды войск (у СССР складалі каля 80% асабовага складу ўзбр. сіл); бранятанк. і механізаваныя войскі сталі гал. ударнай сілай С.в. Пасля вайны павялічвалася роля *ракетнай зброі*, сродкаў ППА і інш. У 2-й пал. 20 ст. С.в. некат. краін аснашчаны ядз. зброяй.

Сучасныя С.в. развіваюцца на базе найноўшай ваен. тэхнікі і дасягненняў ваен. навукі. Найб. шматлікія і падрыхтаваныя С.в. маюць краіны НАТО, Кітай, Расія і інш. У склад С.в. Рэспублікі Беларусь уваходзяць *мотастралковыя войскі*, *мабільныя сілы*, *ракетныя войскі і артылерыя*, войскі ППА С.в. (род войск), а таксама часці і падраздзяленні спец. войск (развед., інж., хім., сувязі, *радыёэлектроннай барацьбы* і інш.), тэхн. і тылавога забеспячэння. Арганізацыйна складаюцца з асобных механізаваных брыгад, брыгад мабільных сіл і інш. злучэнняў (часцей), якія ўваходзяць у склад адпаведнага аператыўнага камандавання (Заходняга і Паўночна-Заходняга). Камандаванню С.в. таксама падначалены падраздзяленні тэр. абароны, спец. аперацый і інш.

Літ.: Сагановіч Г.М. Войска Вялікага княства Літоўскага ў XVI—XVII стст. Мн., 1994; Павловский И.Г. Сухопутные войска. М., 1977; Боевая летопись белорусских полков. Мн., 1994; Краснознаменный Белорусский военный округ. 2 изд. М., 1983; Коломоец Ф. Сколько «штыков» должна иметь белорусская армия // Армия. 1996. № 1. *Ю.В.Партноў, С.М.Абрамаў.*

СУХАПУ́ТНЫЯ ЧАРАПА́ХІ (Testudinidae), сямейства чарапах кл. паўзуноў. Больш за 10 родаў, каля 40 відаў. Пашыраны ў Паўд. Еўропе, Азіі, Амерыцы, Афрыцы. 10 відаў і 13 падвідаў занесены ў Чырв. кнігу МСАП.

Даўж. панцыра ад 10 см да 1 м і больш (*слановыя чарапахі*). Спінны шчыт панцыра нерухома злучаны з брушным; абодва ўкрыты тоўстымі буйнымі рагавымі шчыткамі, галава і ногі — дробнымі. Галава поўнасцю хаваецца пад панцыр. Заднія ногі тоўстыя. Пальцы ног зрослыя, іх кароткія кіпцюры свабодныя. Пераважна расліннаедныя. Адкладваюць да 30 яец. Працягласць жыцця да 100—150 гадоў.

СУХА́РТА (Suharto; н. 8.6.1921, Кемусу, каля г. Салатыга, Інданезія), дзяржаў-

ны і ваен. дзеяч Інданезіі. Скончыў ваен. школу ў г. Гомбанг. Ген. арміі. У 1945—49 удзельнік узбр. барацьбы Інданезіі супраць нідэрл. акупантаў. У 1962—63 камандаваў аперацыямі па выгнанні галандцаў з Зах. Ірыяна, у 1963—65 — стратэгічным рэзервам сухапутных войск. У 1965 задушыў спробу дзярж. пераварота, заняў пасады міністра абароны і камандуючага сухапутнымі войскамі. З 1966 нам. прэм'ер-міністра Інданезіі, з 1967 — в.а. прэзідэнта, з 1968 прэзідэнт Інданезіі. Ажыццяўляў палітыку «новага ладу», якая прадугледжвала развіццё рыначных адносін і арыентацыю на краіны Захаду пры жорсткім аўтарытарным рэжыме, што прывяло да эканам. ўздыму краіны ў 1970—80-я г. Аднак рост знешняй запазычанасці і карупцыя сталі прычынай



1



2



3



4

Сухапутныя чарапахі: 1 — зорчатая; 2 — сярэднеазіяцкая; 3 — лясная, або шабуці; 4 — вугальная.



1



2



3



4

Да арт. **Сухапутныя войскі**: 1 — танкавае падраздзяленне на маршы; 2 — агонь вядзе разлік процітанкавай гарматы; 3 — навядзенне пантоннага моста; 4 — воіны інжынерных войск рыхтуюць да запуску зарад з установкі размініравання УР-83П.

фін. крызісу ў сярэдзіне 1990-х г. Пад націскам масавых нар. выступленняў у маі 1998 падаў у адстаўку.

СУХАРЫ́, вёска ў Магілёўскім р-не, на р. Раста, на аўтадарозе Магілёў—Мсціслаў. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 27 км на ПнУ ад Магілёва. 610 ж., 230 двароў (2002). Прадпрыемства па перапрацоўцы піламатэрыялаў. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, бальніца, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Помнік архітэктуры — Успенская царква (пач. 20 ст.).

Вядомы з 1560 як сяло ў Магілёўскай воласці ВКЛ, дзярж. ўласнасць. З 1569 належала баярыну І.Кіркораву. З 1772 у Рас. імперыі, з 1773 цэнтр староства ў Аршанскай правінцыі Магілёўскай губ., уладанне Пацея. З 1784 мястэчка С.; 93 ж., 19 двароў, царква, вадзяны млын, 1 кірмаш на тыдзень. У 1856 уладанне М.Лістоўскай. У 1880 у мястэчку і сяле 730 ж., 133 двары. У 1886 мястэчка ў Чавускім пав. Магілёўскай губ., 445 ж., 65 двароў, царк.-прыходская школа (1887), царква, сінагога, вадзяны млын, 2 карчмы, 2 крамы; у 1891 пабудавана мураваная Пакроўская царква. У 1909 у сяле 814 ж., 113 двароў, у мястэчку 500 ж., 64 двары, уладанне Лістоўскіх; нар. вучылішча, паштовае аддзяленне. З 20.8.1924 цэнтр сельсавета ў Лупалаўскім р-не Магілёўскай акр., з 2.3.1931 у Чавускім р-не, з 1938 у Магілёўскай вобл. У 1939 да вёскі далучаны пас. Альхавецкі і Саснавецкі. У Вял. Айч. вайну С. спалены, у паслявае. перыяд адбудаваны. *В.В.Віталёва.*

СУХА́РЫКІ (арх.), тое, што *дэнтыкулы.*

СУХАСТО́Й, засохлыя на корані дрэвы ці дрэвастоі. Утвараецца пры натуральным адміранні, пашкоджванні дрэвавых раслін хваробамі ці шкоднікамі, пры рэзкіх ваганнях умоў існавання, выкліканых прыроднымі або антрапагеннымі фактарамі (забалочванне, сонечныя апёкі, засуха, маразы, пажары, ушчыльненне глебы пры няправільнай пасьбе жывёлы, зніжэнне ўзроўню грунтавых вод і інш.). Засохлыя дрэвы становяцца ачагамі распаўсюджвання шкоднікаў і хвароб. Для прадухілення ўтварэння С. праводзяць санітарныя высечкі лесу, ліквідацыю ачагоў захворвання дрэў.

СУХАЦВЕ́ТЫ, б я с с м е р т н і к і, і м а р т э л і, расліны некалькіх родаў — *цмену*, акраклініуму (Acroclinium), амобіуму (Ammobium), сухацвету (Xeranthemum) і інш. сям. складанакветных.

Кветкавыя кошыкі ў С. маюць абгортку з яркаафарбаваных скурыстых або плевачных лісточкаў, якія не мяняюць колеру і формы пры высыханні. Выкарыстоўваюцца на зімовыя букеты, вянкі, гірлянды.

«СУХА́Я ІГО́ЛКА», тэхніка паглыбленай *гравюры* на метале, заснаваная на прадрапванні штрыхоў іголкай. Для гравюр, выкананых у тэхніцы «С.і.», характэрна асаблівая аксаміцістасць штрыхоў (што набліжае іх да малюнка), якія ўзнікаюць за кошт пакінутых іголкай завусеніц (т.зв. барбы). «С.і.» часта дапаўняе тэхніку *афорта*, але ў параўнанні з ім дае менш адбіткаў. Вядома з 15 ст. Як самаст. тэхніка пашырана з 19 ст.

СУХА́Я ПЕРАГО́НКА ДРАЎНІ́НЫ, тое, што *піроліз драўніны.*

СУХІ́ Павел Восіпавіч (22.7.1895, г. Глыбокае Віцебскай вобл. — 15.9.1975), савецкі авіяканструктар, адзін са стваральнікаў рэактыўнай і звышгукавой авіяцыі. Д-р тэхн. н. (1940). Двойчы Герой Сац. Працы (1957, 1965). Скончыў Маск. вышэйшае тэхн. вучылішча (1925). З 1925 у Цэнтр. аэрагідрадынамічным ін-це. У 1939—49 і з 1953 гал. канструктар доследнага КБ (з 1976 яго імя), з 1956 ген. канструктар. З 1932 узначальваў праектаванне самалётаў РД (АНТ-25) і «Радзіма» (АНТ-37біс), знішчальніка-манаплана з хаваемым у палёце шасі І-14. Пад яго кіраўніцтвам створаны шматмэтавы самалёт Су-2 (1937), браніраваны штурмавік Су-6 (1943), рэактыўны франтавы знішчальнік Су-9 з тармазным парашутам і катапультай (1946), звышгукавыя рэактыўныя знішчальнікі-перахопнікі з герметычнай кабінай Су-15 (1948), са стрэлападобным і трохвугольным крыламі (1956), знішчальнік са зменнай геаметрыяй крыла Су-17 (1966), франтавы бамбардзіроўшчык Су-24 (1970), браніраваны звышгукавы штурмавік Су-25, высокаманеўраны знішчальнік Су-27, стратасферны стратэгічны разведчык-ракетаносец Т-4. Канструктар больш як 50 мадэлей самалётаў, больш за 20 з іх выпускаліся серыйна. На самалётах яго канструкцыі ўстаноўлены рэкорды свету па працягласці, вышыні і скорасці палёту. Ленінская прэмія 1968. Дзярж. прэміі СССР 1943, 1975. Залаты медаль імя А.М.Тупалева АН СССР (1975). Яго імем названы Гомельскі тэхн. ун-т. У Гомелі бронзавы бюст.



П.В.Сухі.

Літ.: П о н о м а р е в А.Н. Советские авиационные конструкторы. 2 изд. М., 1980; К у з ь м и н а Л.М. Генеральный конструктор Павел Сухой: (Страницы жизни). Мн., 1985; С а у л і ч У. Ірвуцца ў неба імклівыя Су // Бел. думка. 1999. № 5. *М.М.Касцюковіч.*

«СУХІ́ ЗАКО́Н», закон аб забароне вытворчасці і продажу спіртных напіткаў. Дзейнічаў у ЗША (1920—33) і ў некаторых інш. дзяржавах. У ЗША, Ісландыі, Фінляндыі і інш. «С.з.» не прывёў да жаданай мэты. У Бельгіі, Францыі, Нарвегіі і інш. у розны час уводзіліся забараняльныя законы на напіткі пэўнага мацунку. У Швецыі з 1865 дзейнічала т.зв. Гатэнбургская сістэма, якая пазней з відазмяненнямі была ўведзена ў інш. скандынаўскіх краінах. Паводле гэтай сістэмы продаж спіртных напіткаў дазваляўся толькі адначасова з гарачай ежай, а рэстаратар атрымліваў даход выключна ад продажу харч. прадуктаў. З 1919 замест Гатэнбургскай была ўведзена картачная сістэма (т.зв. сістэма Брата), якая абмяжоўвала ўжыванне спіртных напіткаў да 4 л у месяц. У 1955—57 сістэма Брата адмерла, а «шведскі дэпартамент цвярозасці» фактычна быў зведзены на становішча статыстычнай установы. У Расіі забарона вытв-сці і продажу спіртных напіткаў была ўведзена ў 1914 і дзейнічала да 1925. Аднак забараняльныя меры прывялі да таго, што ў абход закона замест віна і гарэлкі сталі ўжываць розныя сурагаты, якія аказвалі яшчэ больш шкоднае ўздзеянне на арганізм. Чарговая спроба выкараніць п'янства і алкагалізм у б. СССР была зроблена ў 1980-я г. ў час праўлення М.С.Гарбачова. Яна пацягнула паўсюднае знішчэнне элітных вінаграднікаў і ажыятажны попыт на алкагольныя напіткі. *Г.А.Маслыка.*

СУХІ́ КЛІ́МАТ, тое, што *арыдны клімат.*

СУХІ́ ЛЁД, назва цвёрдага *вугляроду дыаксіду* CO_2, які ў звычайных умовах (атм. ціск, пакаёвая т-ра) узганяецца. Белая снегападобная маса (шчыльн. 1560 кг/м^3), у якую пры атм. ціску і моцным (ніжэй за т-ру ўзгонкі -78,5 °С) ахаладжэнні ператвараецца CO_2 (адсюль назва). У тэхніцы С.л. атрымліваюць частковым выпарваннем вадкага вуглякіслага газу (CO_2 звадкоўваецца пры 20 °С і ціску 5,7 МПа). Выкарыстоўваюць як холадагент у харч. прам-сці (выпарваецца без рэшткаў, не выклікае карозіі абсталявання).

«СУХІ́ ПЭ́НДЗАЛЬ» у ж ы в а п і с е і г р а ф і ц ы, тэхнічны, часам дапаможны, прыём — работа цвёрдым пэндзлем, слаба насычаным фарбай (звычайна алейнай па светлым незагрунтаваным палатне). Часцей выкарыстоўваецца для дэкар.-афармленчых работ.

СУХІ́ ТУМА́Н, тое, што *імгла.*

СУХІ́Н Аскольд Аўрамавіч (2.5.1941, г. Архангельск, Расія — 19.2.1994), бел. спявак (бас). Засл. арт. Беларусі (1971). Скончыў Ін-т мастацтваў у Кішынёве (1965). З 1965 саліст ансамбля песні і танца БВА, з 1966 — Дзярж. т-ра оперы і балета Беларусі, з 1980 — Дзярж. к-та Беларусі па тэлебачанні і радыёвяшчанні, у 1985—90 — Крымскай філармоніі. Валодаў голасам рэдкай прыгажосці і пластычнасці. Сярод партый: Мечык («Калі ападае лісце» Ю.Семянякі), Млынар («Русалка» А.Даргамыжскага), Барыс, Дасіфей («Барыс Гадуноў», «Хаваншчына» М.Мусаргскага), Канчак, Галіцкі («Князь Ігар» А.Барадзіна), Рэнэ, Грэмін («Іаланта», «Яўген Анегін» П.Чайкоўскага), Дон Базіліо

(«Севільскі цырульнік» Дж.Расіні), Рамфіс, Мантэроне («Аіда», «Рыгалета» Дж.Вердзі), Камандор («Дон Жуан» В.А.Моцарта). У камерным рэпертуары рамансы і песні бел. кампазітараў. Лаўрэат міжнар. конкурсаў вакалістаў у Празе (1967) і Сафіі (1968, залаты медаль), міжрэсп. конкурсу вакалістаў імя Я.Вітала (1964). *Т.Б.Варфаламеева.*

СУХО́Е БАЛО́ТА. Нізіннага тыпу ў цэнтр. і паўн. ч. Івацэвіцкага р-на Брэсцкай вобл., пераважна ў вадазборы р. Грыўда. Пл. 16,1 тыс. га, у межах прамысл. пакладу 12,7 тыс. га. Глыб. торфу да 5,3 м, сярэдняя — 1,8 м. Запасы торфу каля 43,3 млн. т (здабываецца на ўгнаенне). На Пн балота пад торфам ёсць сапрапель (Сухабалоцкае радовішча сапрапелю). Асушана каля палавіны плошчы балота, выкарыстоўваецца пад ворыва і сенажаць. Частка масіву ўваходзіць у гідралагічны заказнік *Выганашчанскае*. На неасушанай тэр. пераважаюць бярэзнікі асаковыя.

СУХО́ПАЛЬ, вёска ў Пружанскім р-не Брэсцкай вобл., на аўтадарозе Пружаны—Боркі. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 31 км на ПнЗ ад г. Пружаны, 120 км ад Брэста, 45 км ад чыг. ст. Аранчыцы. 425 ж., 169 двароў (2002). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, амбулаторыя, аптэка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан. Помнік архітэктуры — Крыжаўзвіжанская царква (1903).

Вядома з 1680 як дзярж. вёска ў Брэсцкім пав. ВКЛ. З 1795 у Рас. імперыі, з 1801 цэнтр воласці Пружанскага пав. З 1921 у складзе Польшчы, з 1925 цэнтр гміны Пружанскага пав. Палескага ваяв. З 1939 у складзе БССР, з 12.10.1940 цэнтр сельсавета Шарашоўскага, з 1956 Пружанскага р-на Брэсцкай вобл. У Вял. Айч. вайну ням. фашысты загубілі ў С. і сельсавеце 305 чал. *М.П.Клімец.*

СУХО́ТЫ, тое, што *туберкулёз*.

СУХУ́МІ, горад у Грузіі, на беразе Чорнага м.; сталіца Абхазіі. У 6 ст. да н.э. на тэр. С. існавала ант. калонія Дыяскурыяда. У сярэднія вякі называўся Цхум, у 16 — пач. 19 ст. турэцкая крэпасць Сухум-Кале. З 1848 горад. Каля 140 тыс. ж. (2001). Марскі порт, чыг. ст., вузел аўтадарог. Прам-сць: харч. і харчасмакавая (з-ды кансервавы, малочны, вінаробны; тытунёвая ф-ка; рыба- і мясакамбінаты), лёгкая (тэкст., гарбарна-абутковая), маш.-буд., хімічная. Ун-т. Бат. сад. Малпавы гадавальнік. Тэатр. Музеі: краязнаўчы, літ.-мемар. Дз.І.*Гулія*. Руіны замка (9—10 ст.). Турызм. Горад пацярпеў у выніку *грузіна-абхазскага канфлікту 1990-х г.* Кліматычны і бальнеатэрапеўтычны курорт. Клімат субтрапічны вільготны. Асн. прыродныя лек. фактары: клімат, марскія купанні, мінер. крыніцы (тэрмальныя, сульфатна-хларыдныя натрыевыя воды з бромам, ёдам, магніем і азотныя гідракарбанатна-хларыдна-сульфатныя кальцыева-натрыевыя воды). Лечаць хваробы органаў кровазвароту, дыхання (нетуберкулёзнага характару), скуры, нерв. сістэмы.

СУ́ХЭ-БА́ТАР Дамдзіны (Сухбаатар; 2.2.1893, каля г. Улан-Батар — 22.2.1923), манголькі ваен. і дзярж. дзеяч; адзін з кіраўнікоў *Манголькай нацыянальна-дэмакратычнай рэвалюцыі 1921*. З 1912 служыў у войску *Манголіі Знешняй*; за мужнасць у баях супраць кіт. войск атрымаў ганаровае найменне Батар (волат, герой). У 1919 далучыўся да рэв. гуртко́ў, на аснове якіх у 1920 створана Манг. нар. партыя (МНП). З 1922 чл. ЦК МНП, у 1923 канд. у чл. Прэзідыума ЦК МНП. З 1921 ваен. міністр часовага, потым пастаяннага Нар. ўрада Манголіі, адначасова галоўнакамандуючы Манг. нар. арміяй (МНА). Камандаваў атрадам МНА, які перамог кітайцаў у баі за Маймачэн (18.3.1921). Удзельнічаў у паходзе сав. Чырв. Арміі супраць белагвардзейцаў Р.Ф.*Унгерна фон Штэрнберга* і вызваленні ад іх Ургі. У сав. і манг. гістарыяграфіі да 1990-х г. С.-Б. лічыўся адзіным стваральнікам МНП і кіраўніком манг. рэвалюцыі.

Літ.: Рощин С.К. Политическая история Монголии (1921—1940 гг.). М., 1999.

СУ́ХЭ-БА́ТАР, горад на Пн Манголіі. Адм. ц. Селенгінскага аймака. Утвораны ў 1940. Каля 60 тыс. ж. (2001). Гандл.-трансп. вузел на Трансмангольскай чыгункі, прыстань на р. Архон пры яе ўпадзенні ў Селенгу. Аэрапорт. Прам-сць: дрэваапр., запалкавая, папяровая, харчовая. Домабудаўнічы камбінат. Саматужныя промыслы. Названы ў гонар Д.*Сухэ-Батара*.



Сухумі.

СУ́ЦІН, вёска ў Пухавіцкім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 31 км на ПдУ ад г. Мар'іна Горка, 94 км ад Мінска, 10 км ад чыг. ст. Талька. 461 ж., 225 двароў (2002). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.



Х.**Суцін**. Маленькі кандытар.

СУ́ЦІН Хаім (1893 або 1894, г.п. Смілавічы Чэрвеньскага р-на Мінскай вобл. — 9.8.1943), французскі мастак бел. паходжання; прадстаўнік *парыжскай школы*. Вучыўся ў Віленскай АМ і Школе прыгожых мастацтваў у Парыжы. З 1913 жыў у Францыі. Працаваў пераважна ў жанрах партрэта, пейзажа, нацюрморта. Творчасці ўласцівы пастозная манера пісьма, пачуццёвая экспрэсія, светлая яркая колеравая гама, у якой пераважалі чырвоныя, сіне-зялёныя і белыя тоны. У ранні перыяд знаў уплыў М.*Шагала* («Няня», каля 1916), пазней — А.*Мадыльяні* (партрэты М.Лані, 1929; мадам М.Кастэнг, 1928). Стварыў шэраг карцін па матывах работ Рэмбранта і Г.Курбэ, пісаў пазначаныя драм. лірызмам пейзажы, звяртаўся да вобразаў людзей ніжэйшага саслоўя: «Кандытары», «Маленькі кандытар», «Паляўнічыя», «Туша быка» (3 варыянты, 1925), «Певень» (1926), «Паж» (1927), «Хлопчык з хору» (1928), «Жанчына ўваходзіць у ваду» (1931), «Асёл» (1934), «Дзеці сядзяць на ствале дрэва», «Ветраны дзень у Асеры» (абодва 1939) і інш. *С.У.Пешын.*

СУ́ЦІНА БАЛО́ТА. Нізіннага тыпу ў Асіповіцкім р-не Магілёўскай вобл. і Пухавіцкім р-не Мінскай вобл., у вадазборы рэк Пціч і Свіслач. Пл. 9 тыс. га, у межах прамысл. пакладу 8,4 тыс. га. Глыб. торфу да 3 м, сярэдняя 2,2 м. За-

пасы торфу каля 33 млн. т. Частка балота асушана дрэнажом. Вырошчваюць збожжавыя і прапашныя культуры, сеяныя травы, агародніну. На неасушаных участках хмызнякова-асаковая раслінасць; ёсць пясчаныя астравы, парослыя лесам.

СУЦЬКО́ Пётр Пятровіч (н. 20.5.1936, в. Асошнікі Пружанскага р-на Брэсцкай вобл.), бел. журналіст. Засл. работнік культ. Беларусі (1982). Скончыў БДУ (1964), Маскоўскую вышэйшую парт. школу (1972). З 1957 працаваў у Ружанскай і Іванаўскай раённых газетах, з 1968 у Брэсцкай абл. газ. «Заря» (з 1972 гал. рэдактар).

СУЦЭ́ЛЬНЫ СПЕКТР, неперарыўны спектр, адзін са *спектраў* эл. магн. выпрамянення, размеркаванне энергіі ў якім характарызуецца неперарыўнай функцыяй частаты (даўжыні хвалі). Назіраецца пры выпрамяненні і пры паглынанні.

Напр., С.с. мае выпрамяненне рэчыва, якое знаходзіцца пры зададзенай т-ры ў стане тэрмадынамічнай раўнавагі (гл. *Цеплавое выпрамяненне*), размеркаванне энергіі ў ім ахоплівае ўвесь дыяпазон частот і апісваецца *Планка законам выпрамянення*. У некаторых выпадках назіраецца накладанне *лінейчастых спектраў* на С.с. (гл. *Фраўнгоферавы лініі*). У **аптычнай** вобласці (гл. *Спектры аптычныя*) **пры** раскладанні святла спектральнымі прыладамі С.с. атрымліваецца ў выглядзе неперарыўнай паласы (пры фота- ці візуальнай рэгістрацыі) або плаўнай крывой (пры фотаэл. рэгістрацыі).

СУЧА́ВА (Suceava), горад на ПнУ Румыніі, на р. Сучава (бас. Дуная). Адм. ц. аднайм. жудзеца. Вядомы з 1388, да 16 ст. — сталіца Малдовы. Каля 120 тыс. ж. (2001). Вузел чыгунак і аўтадарог. Аэрапорт. Прам-сць: маш.-буд. (станкабудаванне, вытв-сць падшыпнікаў), хім. (штучныя валокны), цэлюлозна-папяровая, дрэваапр., тэкст., гарбарна-абутковая, харчовая. Гарадскі музей. Руіны крэпасці, замак (14 ст.), цэрквы (15—17 ст.), армянскі манастыр (1606), княжацкі пастаялы двор (16—18 ст.). Турызм.

СУЧЖО́Ў, Усянь, горад на У Кітая, у прав. Цзянсу. Засн. ў 5 ст. да н.э. Каля 1 млн. ж. (2001). Вузел чыгунак і аўтадарог, порт на Вялікім канале, паблізу воз. Тайху. Цэнтр с.-г. раёна (рыс, пшаніца, рапс, чай) і шаўкаводства. Прам-сць: шаўковая, металургічная, хім., шкляная, керамічная, папяровая. Саматужная вытв-сць, у т.л. маст. вышыўкі на экспарт. Арх. помнікі 3—16 ст., у т.л. пагады Бэйсыта (6 ст., перабудавана ў 15—16 ст.), Жуйгуанта (3 ст., перабудавана ў пач. 10 ст.), Хуцюта (7 ст., перабудавана ў 10 ст.), Шуанта (10 ст.). Шматлікія масты цераз пратокі і каналы; гіст. помнікі, сады, паркі.

СУЧЛЯНЕ́ННЕ, злучэнне касцей, тое, што *суставы*.

СУ́ША, частка зямной паверхні без акіянаў і мораў. Уключае *мацерыкі* і астравы. Агульная пл. каля 149 млн. км^2 (29,2% паверхні Зямлі, 39% Паўн. і 19% Паўд. паўшар'яў), сярэдняя выш. 875 м над узр. м., макс. — 8848 м (г. Джамалунгма ў Азіі), мінім. — 400 м ніжэй узр. м. (узровень Мёртвага м. на З Азіі). У паняцце С. звычайна не ўключаюцца азёры і вадасховішчы.

СУ́ША, рака ў Клічаўскім і Кіраўскім р-нах Магілёўскай вобл., левы прыток р. Ольса (бас. р. Дняпро). Даўж. 40 км. Пл. вадазбору 354 км^2. Пачынаецца за 2 км на У ад в. Рагі Клічаўскага р-на, вусце за 700 м на Пд ад в. Ваевічы Клічаўскага р-на. Цячэ ў межах Цэнтральнабярэзінскай раўніны, на вял. працягу праз лясныя масівы. Даліна слабавыразная, у ніжнім цячэнні зліваецца з далінай р. Ольса, шыр. ад 500 м да 1 км. Пойма перарывістая, чаргуецца па берагах, месцамі забалочаная. Рэчышча ад вытоку на працягу 7,5 км каналізаванае, ніжэй свабодна меандруе, моцназвілістае, шыр. 5—7 м. Прымае сцёк з сеткі меліярац. каналаў.

СУ́ША, вёска ў Лепельскім р-не Віцебскай вобл., паміж азёрамі Цеменіца, Астроўкі, Вогзіна. Цэнтр сельсавета і саўгаса. За 33 км на ПнУ ад горада і чыг. ст. Лепель, 105 км ад Віцебска. 636 ж., 307 двароў (2002). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан.

СУ́ША Мікалай Васілевіч (н. 4.2.1952, в. Вайнілава Чэрвеньскага р-на Мінскай вобл.), бел. вучоны ў галіне эканомікі і кіравання. Канд. эканам. н. (1997). Скончыў Бел. ін-т нар. гаспадаркі (1985). З 1973 на парт. і сав. рабоце. З 1980 дырэктар з-да «Біяпрадукт», з 1987 нам. старшыні Чэрвеньскага райвыканкома, у 1989—93 прэзідэнт Саюза кааператываў Беларусі. Заснавальнік Мінскага ін-та кіравання (з 1994 яго рэктар), заснавальнік і гал. рэдактар час. «Экономика. Управление. Право». Распрацаваў стратэгію кіравання інавацыямі ў сістэме вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Тв.: Информатизация организационно-экономического управления негосударственным вузом на современном этапе развития высшего образования. Мн., 1996; Управление высшим учебным заведением на примере частных вузов Республики Беларусь. Мн., 2000; Финансовый менеджмент вуза. Мн., 2001; Экономический механизм стратегического управления развитием высшего учебного заведения. Мн., 2001. *М.П.Савік.*

СУ́ША Якуб (свецкае імя Ян; 1610, Мінск — 4.3.1685), бел. грамадскі і рэліг. дзеяч. Д-р тэалогіі. Вучыўся ў мінскай базыльянскай школе, у Пултуску (Польшча), Оламаўцы (Чэхія), Рыме. У 1626 прыняў манаства. Выкладаў філасофію і тэалогію ў базыльянскіх манастырах. З 1652 архіепіскап холмскі. У 1661 выбраны генералам ордэна базыльян. Пісаў пераважна на лац. мове. Аўтар твораў «Уваскрэслы фенікс...», «Аб дзеяннях уніятаў...» (абодва 1646), «Савел і Павел» (1666). Яму прыпісваецца твор «Пра іерэйскія павіннасці» (1670, на стараж.-бел. літ. мове). Творы С. насычаны вытрымкамі з пастаноў, лістоў дзярж. і рэліг. дзеячаў; яны сведчаць пра эрудыцыю і веды аўтара. Некат. яго творы перавыдадзены ў Парыжы і Лейпцыгу ў сярэдзіне 19 ст.

У.Г.Кароткі.



Сушаніца: 1 — лясная; 2 — багнавая.

СУ́ШАНІЦА (Gnaphalium), род кветкавых раслін сям. складанокветных. 50 (паводле інш. звестак 300) відаў. Пашыраны ўсюды, акрамя тропікаў. На Беларусі 2 віды С.: багнавая, або балотная (G. uliginosum), і жоўта-белая (G. luteo-album). Трапляюцца па берагах рэк, на поймавых лугах, як пустазелле.

Адна-, двух- і шматгадовыя травяністыя расліны з лямцавым апушэннем. Сцёблы прамастойныя ці прыўзнятыя, галінастыя. Лісце падоўжанае, суцэльнае, чаргаванае. Кошыкі невял., апушаныя, сабраныя ў шчытка-, клубочка- ці коласападобныя, вузкамяцёлчатыя суквецці на верхавінках парасткаў. Плод — сямянка. Лек., дэкар. расліны.

А.М.Скуратовіч.

СУША́НКА, рака ў Клічаўскім р-не Магілёўскай вобл., левы прыток р. Ольса (бас. р. Дняпро). Даўж. 20 км. Пл. вадазбору 174 км^2. Пачынаецца ў лясным урочышчы Скобленкава Паляна за 4 км на Пн ад в. Развадаў, вусце за 500 м на ПнУ ад в. Патока. Цячэ пераважна сярод лесу ў межах Цэнтральнабярэзінскай раўніны.

СУ́ШКА, выдаленне вадкасці (пераважна вільгаці) з цвёрдых, вадкіх і газападобных матэрыялаў; адзін з асн. тэхнал. працэсаў у прам-сці, сельскай гаспадарцы і буд-ве. Мэта С. — паляпшэнне якасці рэчываў і матэрыялаў, падрыхтоўка іх да перапрацоўкі, выкарыстан-

ня, транспарціроўкі і працяглага захоўвання.

Звычайна ажыццяўляецца шляхам *выпарэння* вадкасці і адвядзення пары, што ўтварылася пры падвядзенні цеплаты да матэрыялу пераважна пры дапамозе т.зв. сушыльных агентаў (нагрэтае паветра, топачныя газы і інш.).

У тэхніцы найб. пашырана С. вільготных цвёрдых матэрыялаў (зярністых, парашкападобных, грануляваных, ліставых, тканых і інш.) з выкарыстаннем *сушылак* і сублімацыйнай С. (гл. *Сублімацыя*). Выкарыстоўваюць і інш. метады абязводжвання, напр., С. вадкасцей распыленнем і хім. звязваннем вільгаці рэчывамі (метал. *натрый*, *кальцыю карбід* і інш.), што не ўзаемадзейнічаюць з вадкасцямі, якія асушваюць; паглынанне вадзяной пары гіграскапічнымі рэчывамі (кальцыю хларыд, канцэнтраваная серная кіслата і інш.) і цвёрдымі *адсарбентамі* з высокай удзельнай паверхняй. Асн. метады С., ці асушкі, газаў заснаваны на абсорбцыі ці адсорбцыі вільгаці, а таксама на яе кандэнсацыі пры ахаладжэнні газу.

Літ.: Сажин Б.С. Основы техники сушки. М., 1984; Жданова Н.В., Халиф А.Л. Осушка углеводородных газов. М., 1984; Муштаев В.И., Ульянов В.М. Сушка дисперсных материалов. М., 1988.

СУ́ШКІН Пётр Пятровіч (8.2.1868, г. Тула, Расія — 17.9.1928), расійскі вучоны ў галіне заалогіі. Акад. АН СССР (1923). Скончыў Маскоўскі ун-т (1889). З 1910 праф. Харкаўскага, з 1919 Таўрычаскага (г. Сімферопаль) ун-таў. З 1921 у Геал. і Заал. музеях, з 1927 акадэмік-сакратар аддзялення фізіка-матэм. навук АН СССР. Навук. працы па арніталогіі, зоагеаграфіі, параўнальнай анатоміі і палеанталогіі пазваночных.

СУШКО́ Алена Пятроўна (н. 6.8.1925, в. Ліпень Асіповіцкага р-на Магілёўскай вобл.), бел. вучоны ў галіне педыятрыі. Д-р мед. н. (1974), праф. (1979). Скончыла Віцебскі мед. ін-т (1951), дзе і працавала да 1991 (з 1972 заг. кафедры). Навук. працы па вывучэнні клінічных праяў захворванняў у дзяцей.

Тв.: Биоритмы и клинические проявления инфекционных заболеваний у детей. Мн., 1982; Детские болезни. Мн., 1988 (разам з Л.М.Тупковай, В.А.Селязнёвай).

СУШКО́ Павел Міхайлавіч (20.11.1909, в. Сушкі Міёрскага р-на Віцебскай вобл. — 26.9.1974), бел. паэт. Працаваў на сельскай гаспадарцы. Пасля ўз'яднання Зах. Беларусі з БССР — старшыня сельсавета. Друкаваўся з 1938. Пісаў пра зах.-бел. падполле, гераізм партызан у Вял. Айч. вайну, мірную працу, родную прыроду. У вершах шчырасць, жыццёвая назіральнасць. Некат. вершы пакладзены на музыку.

Тв.: У кн.: Сцягі і паходні. Мн., 1965; У паходзе. Мн., 1985; Партызаны, партызаны... Мн., 1985.

СУШКО́ Пятро (Пётр Паўлавіч; 1.1.1937, в. Сушкі Міёрскага р-на Віцебскай вобл. — 20.11.1996), бел. паэт. Сын П.М.*Сушко*. Скончыў БДУ (1966). Працаваў у міёрскай райгазеце, газ. «Віцебскі рабочы», «Звязда», «Літаратура і мастацтва», час. «Вожык», з 1989 у выд-ве «Полымя». Друкаваўся з 1954. Аўтар зб-каў сатыр. і гумарыстычных вершаў, баек, мініяцюр, вершаваных фельетонаў, пародый і эпіграм: «Ганарлівы сучок» (1975, пад псеўд. Цімох Дзераза), «Восці напагатоў» (1978), «Парнаская кузня» (1981); кн. лірыкі «Пратока» (1976). Для дзяцей зб-кі «Вясёлы Бай» (1980), «Чмялёва гушкалка» (1986), «Ехаў кот у лес па дровы» (1990). Яго творам уласцівы дасціпнасць, афарыстычнасць, мяккі гумар. Напісаў жартоўныя варыяцыі на фальклор. тэмы «Касіў Ясь канюшыну» (1976), першы ў бел. л-ры вянок парадыйных санетаў «Паэтычнае веча» (1983 пад псеўд. Цімох Дзераза) і вянок гумарыст. актаў «Роздум ля Парнаса» (1983, пад псеўд. Кірша Рымар).

Тв.: Бігосаўскі паром. Мн., 1994; Жораў з выраю вярнуўся. Мн., 1994. *І.У.Саламевіч.*

СУ́ШНЯ, старадаўняя гасп. пабудова для сушкі лёну, збажыны, канапель і інш. Вядома ў многіх народаў Еўропы. На Беларусі пашыраны ў 16 — пач. 20 ст. Будаваліся пераважна з дрэва. Як С. выкарыстоўваліся *асеці*, ёўні, часам саладзільні, *лазні*.

СУШЧО́ВА, вёска ў Мазалаўскім с/с Віцебскага р-на, каля р. Лужасянка. Цэнтр калгаса. За 26 км на Пн ад Віцебска, 17 км ад чыг. ст. Лужасна. 362 ж., 125 двароў (2002). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан.

СУШЧЭ́НЯ Леанід Міхайлавіч (н. 11.11.1929, в. Малыя Лукі Баранавіцкага р-на Брэсцкай вобл.), бел. вучоны ў галіне заалогіі. Акад. Нац. АН Беларусі (1980, чл.-кар. 1972), д-р біял. н. (1970), праф. (1980). Акад. Рас. АН (1990). Замежны чл. Польскай АН (1994) і Літ. АН (1995). Засл. дз. нав. Беларусі (1978). Скончыў БДУ (1953). З 1956 у БДУ, з 1959 на Севастопальскай біял. станцыі АН СССР, з 1964 у Ін-це біялогіі паўд. мораў АН Украіны. З 1971 заг. аддзела, з 1980 дырэктар Ін-та заалогіі, адначасова ў 1979—92 акадэмік-сакратар Аддзялення біял. навук, у 1992—97 прэзідэнт, з 1997 саветнік Прэзідыума Нац. АН Беларусі. Навук. працы па першаснай і другаснай прадукцыі вадаёмаў, экалаг. фізіялогіі, жыўленні, дыханні, росце і балансе энергіі водных беспазваночных жывёл, ахове прыроды і навакольнага асяроддзя.

Тв.: Интенсивность дыхания ракообразных. Киев, 1972; Количественные закономерности питания ракообразных. Мн., 1975; Рост водных животных при переменных температурах. Мн., 1978 (разам з Г.А.Галкоўскай); Биология и продукция ледниковых реликтовых ракообразных. Мн., 1986 (разам з В.П.Сяменчанкам, В.В.Вежнаўцом); Совершенствование принципов и методов охраны и рационального использования животного мира. Мн., 1990 (разам з М.М.Пікулікам); Животный мир и радиация. Мн., 1991 (разам з М.М.Пікулікам, А.Я.Пленіным).

Літ.: Л.М.Сущеня: (К 70-летию со дня рождения). Мн., 1999.

СУШЫ́ЛКА, апарат, прыстасаванне, установка для выпарэння вадкасці з розных матэрыялаў. Паводле спосабу перадачы цяпла С. падзяляюцца на канвекцыйныя (цяпло перадаецца непасрэдным сутыкненнем з нагрэтым газам); кантактныя (матэрыял сутыкаецца з гарачай паверхняй); радыяцыйныя (цяпло перадаецца вылучэннем ад розных нагрэтых паверхняў, напр., лямпаў і г.д.); індукцыйныя (нагрэў ажыццяўляецца токамі высокай частаты). У залежнасці ад матэрыялу, які высушваецца, С. бываюць для кускавых, зярністых (гл. *Зернесушылка*) ці для пастападобных матэрыялаў, растворaў, суспензій. Для высушвання тэрмаадчувальных матэрыялаў (хім.-фармацэўтычных прэпаратаў, вакцыны і інш.) выкарыстоўваюць сублімацыйную сушку (гл. *Сублімацыя*).



Л.М.**Сушчэня**.

СУ́ШЫНА, возера ў Полацкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Нача, за 28 км на ПдЗ ад г. Полацк. Пл. 1,01 км², даўж. 1,4 км, найб. шыр. 1 км, найб. глыб. 7,5 м, пл. вадазбору 16,6 км². Катлавіна тэрмакарставага тыпу. Схілы выш. 6—9 м, разараныя; на выш. 0,5—1,2 м тэраса; на Пн, ПнУ і Пд, дзе да возера прымыкае балота, схілы невыразныя. Берагі нізкія, пясчаныя, парослі водна-балотнай расліннасцю. На ПнУ і Пд забалочаная пойма шыр. да 100 м, укрыта хмызняком. Дно выслана пяском і апясчаненым ілам. Надводная расліннасць ў прыбярэжнай ч. шыр. да 10 м, пашырана на глыб. да 3,5 м. Падводная расліннасць развіта да глыб. 4,3 м. Злучана пратокамі з воз. Жураўна і р. Нача, упадаюць 2 меліярац. канавы, сцёк па Будзькаўшчынскім канале.

СУШЫ́НСКІ Язэп Францавіч (1885, в. Юраны Браслаўскага р-на Віцебскай вобл. — 1967), бел. культ.-грамадскі дзеяч. Скончыў Пецярбургскі ун-т. За ўдзел у студэнцкіх выступленнях 1905 арыштаваны і зняволены ў турму «Крыжы». З 1907 чл. Бел. сацыяліст. грамады. Адзін з заснавальнікаў створанай у маі 1917 *Беларускай народнай партыі сацыялістаў*, старшыня яе Арганізац. бюро. Удзельнік Усебел. з'езда (снеж. 1917, Мінск). У 1921—30 працаваў у Наркамаце асветы БССР, Інбелкульце, Ін-це мовазнаўства АН Беларусі. У ліп. 1930 арыштаваны органамі АДПУ па справе «*Саюза вызвалення Беларусі*» і ў крас. 1931 сасланы на 5 гадоў у г. Уфа. У ліп. 1935 Асобай нарадай НКУС асуджаны на дадатковы тэрмін. Пасля рэабілітацыі ў ліст. 1957 вярнуўся ў Мінск.

Аўтар успамінаў пра Я.Купалу, з якім быў знаёмы з 1910. *А.С.Ліс.*

СУ́ЭЦ, горад на Пн Егіпта. Адм. ц. аднайм. мухафазы. Стараж. гарады на месцы сучаснага С. існавалі да н.э. Развіццё горада звязана з буд-вам і адкрыццём у 1869 *Суэцкага канала.* Каля 400 тыс. ж. (2001). Порт каля выхаду з Суэцкага канала ў Чырвонае м. Вузел чыгунак і аўтадарог. Міжнар. аэрапорт. Гандл.-транзітны цэнтр міжнар. значэння. Прам-сць: нафтахім., нафтаперапр., цэм., харчасмакавая, суднабудаванне і суднарамонт.

СУ́ЭЦКІ ЗАЛІ́Ў. У Чырвоным м. паміж Сінайскім п-вам і берагам Афрыкі. Даўж. каля 325 км, шыр. 15—46 км, глыб. да 80 м. Прылівы паўсутачныя (да 1,8 м). *Суэцкім каналам* злучаны з Міжземным м. Гал. порт — Суэц.

СУ́ЭЦКІ КАНА́Л, штучны водны шлях міжнар. значэння на тэр. Егіпта праз *Суэцкі перашыек* у самай вузкай яго частцы. Злучае Міжземнае і Чырвонае моры. Умоўная геагр. мяжа паміж Азіяй і Афрыкай. Уключае азёры Тымсах, Вял. Горкае і ўласна канал (Суэц—Ісмаілія—Порт-Саід). Даўж. 161 км, шыр. 120—318 м, мінім. — 60 м, глыб. 16,2 м, на фарватэры да 18 м. Без шлюзаў. С.к. злучаны з сеткай водных шляхоў Ніжняга Егіпта (канал Ісмаілія—Каір—Ніл, 145 км), мае арашальнае адгалінаванне (Абасія, 38 км). Штогадовы аб'ём перавозак па С.к. больш за 80 млн. т. Магчыма плаванне танкераў і нафтабалкераў да 200 тыс. т дэдвейт з асадкай 2,5—3 м. Гал. ўваходныя парты: Порт-Саід з Міжземнага і Суэц з Чырвонага мораў.

Каля 2-га тыс. да н.э. быў пракапаны канал, які злучаў Ніл з Чырвоным морам і часткова праходзіў па ложы сучаснага С.к.: ён праіснаваў да 8 ст. н.э. У 1850-я г. створана Усеагульная кампанія С.к., гал. пайшчыкамі якой былі ўрады Францыі, Егіпта і Банк Ватыкана. У 1859 пачалося будаўніцтва С.к. на чале з франц. інжынерам Ф.Лесепсам; 17.11.1869 адбылося яго адкрыццё. Цяжкае фін. становішча Егіпта ў 1875 прымусіла яго хедзіва (правіцеля) Ісмаіла прадаць сваю долю кампаніі С.к. Вялікабрытаніі, якая ўзяла зону канала пад свой поўны кантроль. Пасля перамогі рэвалюцыі «*Свабодных афіцэраў*» новы ўрад Егіпта дамогся эвакуацыі брыт. войск з зоны С.к., а 26.7.1956 нацыяналізаваў яго. Спробы Вялікабрытаніі і Францыі аднавіць свой кантроль над С.к. выліліся ў *Суэцкі крызіс 1956.* У выніку араба-ізраільскіх войнаў 1967 і 1973 С.к. быў значна разбураны, суднаходства па ім адноўлена ў 1975.

Літ.: Щенников Б. Суэцкий канал от фараонов до наших дней // Азия и Африка сегодня. 1999. № 11.

СУ́ЭЦКІ КРЫ́ЗІС 1956, міжнародны канфлікт, выкліканы нацыяналізацыяй 26.7.1956 Егіптам *Суэцкага канала.* Імкнучыся аднавіць кантроль над каналам, яго б. ўладальнікі Вялікабрытанія і Францыя заключылі сакрэтнае пагадненне з Ізраілем пра сумесныя дзеянні супраць Егіпта. Пад маркай барацьбы супраць рэйдаў палесцінскіх партызан на тэр. Ізраіля і егіпецкай блакады Тыранскага прал., ізраільская армія атакавала 29 кастр. егіпецкія войскі на Сінайскім п-ве і рушыла ў напрамку Суэцкага канала. Урады Вялікабрытаніі і Францыі прапанавалі сябе ў якасці «пасрэднікаў», запатрабаваўшы ва ультыматыўнай форме абодва бакі адысці на 10 міль ад канала; англ. і франц. войскі павінны былі заняць зону канала, нібыта для раз'яднання егіпецкай і ізраільскай армій. Егіпецкі ўрад адхіліў ультыматум, і 31 кастр. англа-франц. авіяцыя атакавала егіпецкія войскі і бамбіла Порт-Саід. 5 ліст. аб'яднаныя англа-франц. войскі высадзіліся ў зоне канала і акупіравалі яго паўн. частку. Гэтыя дзеянні выклікалі пратэсты сусв. супольнасці. Урад СССР пагражаў умяшаннем на баку Егіпта. Гэта прымусіла ўрады Вялікабрытаніі і Францыі пагадзіцца 7 ліст. на перамір'е і вывесці свае войскі з зоны канала да 22 снежня. Войскі Ізраіля да сак. 1957 пакінулі Сінай і сектар Газа. Такім чынам С.к. 1956 скончыўся поўнай няўдачай для Вялікабрытаніі і Францыі.

СУ́ЭЦКІ ПЕРАШЫ́ЕК, паласа сушы, якая падзяляе Міжземнае і Чырвонае моры, на тэр. Егіпта; злучае мацерыкі Афрыка і Азія. Шыр. да 112 км. Пустынная раўніна выш. да 107 м. Саланчакі, салёныя азёры. Клімат субтрапічны пустынны. Цераз С.п. праходзіць *Суэцкі канал.*

СУ́Я, возера ў Полацкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Тураўлянка, за 18 км на Пд ад г. Полацк. Пл. 1,54 км^2, даўж. 2,8 км, найб. шыр. 820 м, найб. глыб. 3,6 м, даўж. берагавой лініі 8,1 км, пл. вадазбору 787 км^2. Катлавіна падпруднага тыпу. Схілы выш. 5—8 м, на ПдУ і месцамі на Пд да 10—14 м, пясчаныя, пад лесам, на Пн разараныя. Участкамі на выш. 1—3 м абразійны ўступ. Пойма шыр. 10—20 м забалочаная, пад хмызняком. Берагі нізкія, пясчаныя, месцамі забалочаныя, сплавінныя, утвараюць некалькі заліваў і паўастравоў. Дно выслана сапрапелем, у прыбярэжнай зоне пясчанае. Прыбярэжная паласа надводнай расліннасці шыр. 8—50 м, пашырана да глыб. 0,7 м; падводная расліннасць развіта да глыб. 2 м. Упадаюць 4 ручаі, злучана пратокамі з азёрамі Гомель і Туроўля. Уваходзіць у зону адпачынку Азёрная.

СФА́ГНАВЫЯ ІМХІ́ (Sphagnidae), падклас лістасцябловых імхоў. 1 сям., 1 род, больш за 300 відаў. Пашыраны ўсюды, акрамя арктычных пустынь. На Беларусі 35 відаў. Найб. вядомыя: сфагнум адагнуты (Sphagnum recurvum), вузкалісты (S. angustifolium), дуброўны (S. nemoreum), магеланскі (S. magellanicum). Сфагнум Ліндберга (S. lindbergii) і мяккі (S. molle) занесены ў Чырв. кнігу. Трапляюцца на балотах (пераважна вярховых і пераходных), вільготных лугах і ў лясах.

Жоўта-зялёныя, бурыя ці чырванаватыя, двухдомныя або аднадомныя расліны. Дзярнінкі буйныя, мяккія, часта ўтвараюць суцэльнае покрыва. Сцёблы без *рызоідаў*, прамастойныя, з пучкападобна размешчанымі галінкамі, сабранымі на верхавінцы ў галоўку. Лісце мае 2 тыпы клетак — хларафіласносныя і ваданосныя, якія абумоўліваюць у С.і. высокую вільгацяёмістасць. Спарагоніі адзінкавыя, каробачка шарападобная. Мужчынскія і жан. *гаметангіі* на розных парастках. Штогод С.і. нарастаюць верхавінкай, знізу адміраюць і ператвараюцца ў *торф*. Сфагнум магеланскі і буры (S. fuscum) — асн. торфаўтваральнікі на вярховых балотах умеранага пояса Паўн. паўшар'я. Маюць бактэрыцыдныя ўласцівасці.



Да арт. **Сфагнавыя імхі**. Сфагнум: 1 — магеланскі; 2 — Гіргензона.

СФАКС, горад на ўсх. узбярэжжы Туніса. Адм. ц. аднайм. вілаета. Засн. ў 9 ст. на месцы стараж.-рым. горада Тапарура. Каля 250 тыс. ж. (2001). Марскі порт (вываз фасфарытаў і с.-г. прадукцыі), вузел аўтадарог, чыг. станцыя. Аэрапорт. Прам-сць: алейная, тэкст., хім. (вытв-сць суперфасфату), металаапр., гарбарна-абутковая. Рамёствы, саматужная вытв-сць дываноў і саф'яну. Цэнтр с.-г. раёна (аліўкавае дрэва). Музеі: археал., мастацтва і нар. рамёстваў. Арх. помнікі рым. і візант. часу, а таксама 9—19 ст.: Вялікая мячэць (9—10 ст.), рэшткі гар. сцен, палац.

СФАЛЕРЫ́Т (ад грэч. sphaleros падманлівы), цынкавая падманка, мінерал класа сульфідаў, сульфід цынку, ZnS. Мае цынку да 67%, дамешкі жалеза, медзі, ртуці, кадмію, марганцу, індыю, волава, кобальту, галію, серабра і інш. Крышталізуецца ў кубічнай сінганіі. Утварае тэтраэдрычныя або кубаактаэдрычныя крышталі (часта са штрыхоўкай, спіралямі росту на гранях), суцэльныя зярністыя агрэгаты, парашковыя масы і інш. Бываюць бясколерныя, светла-карычневага, бурага, чорнага, жоўтага, чырвонага, зялёнага, шэрага (у залежнасці ад дамешак) колераў. Светлыя С. — празрыстыя. Цв. 3,5—4. Шчыльн. 4 г/см^3. Крохкі. Трапляецца ў

поліметалічных радовішчах. Гал. цынкавая руда, крыніца атрымання кадмію, індыю, галію.

СФЕН, другая назва мінералу *тытаніт*.

СФЕ́РА (ад грэч. sphaira шар) у м а т э м а т ы ц ы, геаметрычнае месца пунктаў прасторы, адлегласць ад якіх да пэўнага фіксаванага пункта (цэнтра) — велічыня пастаянная (радыус). С. можна разглядаць як паверхню, утворануюад вярчэння *акружнасці* вакол свайго дыяметра.

Ураўненне С. з цэнтрам у пункце O (a, b, c) у дэкартавай прамавугольнай сістэме каардынат: $(x - a)^2 + (y - b)^2 + (z - c)^2 = r^2$, дзе r — радыус С., a, b, c — каардынаты пункта O. Плошча паверхні С. вызначаецца формулай $S = 4\pi r^2$. Частка прасторы, абмежаваная С., наз. шарам. Сячэнне С. адвольнай плоскасцю — акружнасць. Датычная плоскасць да С. перпендыкулярная радыусу, праведзенаму ў пункт дотыку. Гл. таксама *Сферычная сістэма каардынат*.



Сфалерыт.

СФЕ́РА АБСЛУГО́ЎВАННЯ, сукупнасць галін эканомікі, прадукцыя якіх вызначаецца пэўнай мэтазгоднай дзейнасцю (асабістыя і вытв. паслугі). У адпаведнасці з сістэмай *нацыянальных рахункаў*, якая з 1994 дзейнічае ў стат. органах Рэспублікі Беларусь, вытв-сць паслуг уключае: паслугі транспарту, сувязі, гандлю, грамадскага харчавання, жыллёва-камунальнай гаспадаркі, культуры, адукацыі, аховы здароўя, бытавыя, банкаў і інш. Адрозніваюць паслугі, якія фінансуюцца насельніцтвам (набыццё тавараў, быт. і жыллёва-камунальныя паслугі, платныя ўстановы культуры, аховы здароўя, адукацыі, пасаж. транспарт, турызм, страхаванне і інш.); паслугі дзярж. устаноў (бюджэтныя расходы дзярж. устаноў на тавары і паслугі індывід. спажывання); паслугі і тавары, якія вылучаюць насельніцтву бясплатна грамадскія арг-цыі, а таксама бясплатныя паслугі ў галіне адукацыі, культуры і аховы здароўя, якія аказваюць сваім работнікам прадпрыемствы і арг-цыі. На 1.1.2001 у Рэспубліцы Беларусь доля паслуг (за выключэннем дзярж. сродкаў, якія выдзяляюцца на навуку, абарону, кіраванне, дарожную гаспадарку і інш. грамадскія патрэбы) у структуры *валавога ўнутранага прадукту* склала 69%.

СФЕ́РА МАТЭРЫЯ́ЛЬНАЙ ВЫТВО́РЧАСЦІ, тэрмін, што ўжываўся ў эканам. навуцы сав. перыяду і азначаў сукупнасць галін нар. гаспадаркі, дзе ствараліся матэрыяльныя каштоўнасці, якія задавальнялі асабістыя і грамадскія патрэбы чалавека. Да яе адносіліся: прам-сць, буд-ва, сельская, лясная і водная гаспадаркі, грузавы транспарт, вытв. сувязь, гандаль, грамадскае харчаванне, мат.-тэхн. забеспячэнне, збыт і інш. Да С.м.в. адносілася і навук. дзейнасць, што ўвасаблялася ў матэрыяльныя даброты: канструктарскія, праектныя, навук. ўстановы, якія непасрэдна абслугоўвалі вытв. дзейнасць. Лічылася, што адмежаванне С.м.в. ад інш. відаў дзейнасці патрэбна для правільнага вызначэння аб'ёмаў *сукупнага грамадскага прадукту* і *нацыянальнага даходу*.

СФЕРАЛІ́Т (ад грэч. sphaira шар + lithos камень), шарападобны агрэгат тонкіх ігольчатых крышталёў радыяльна-прамяністай будовы. Па паходжанні блізкія да канкрэцыйных утварэнняў (гл. *Канкрэцыя*). Трапляюцца ў магматычных і асадкавых горных пародах.

У магматычных пародах С. — эндагенныя кантактавыя ўтварэнні на краявых участках дыябазаў; у кіслых лавах — прадукты кансалідацыі пераважна ў шклістай масе пры яе застыванні; у асн. лавах (варыёлітах) наз. выріёлі. С. фарміруюцца таксама ў газавых пустотах цвёрдай пароды пры другасным выпадзенні цэалітаў, кварцу і інш. (т.зв. псеўдасфераліты). У асадкавых пародах трапляюцца С. карбанатныя, марганцава-жалезістыя, фасфатныя, халцэдонавыя і інш.

СФЕРАПСІДА́ЛЬНЫЯ (Sphaeropsidales), парадак недасканалых грыбоў. Каля 750 родаў, больш за 6 тыс. відаў. Пашыраны ўсюды. На Беларусі некалькі дзесяткаў відаў з родаў *аскахіта*, *септорыя*, *філастыкта*, *фома*. Паразіты і сапратрофы, выклікаюць плямістасці і *некрозы* ў раслін. Паразітуюць на грыбах, лішайніках, водарасцях, насякомых.

Міцэлій добра развіты, галінасты, складаецца са шмат'ядзерных клетак. Канідыяносцы простыя, часам разгалінаваныя, размешчаны на ўнутр. паверхні *пікнід*, наяўнасць якіх — асн. прыкмета парадку. Пікніды звычайна з адтулінай на верхавінцы. *Канідыі* адна-, двух- і шматклетачныя, выходзяць наверх склееныя слізэю ў выглядзе жгута або стужкі. Многія С. — недасканалыя стадыі аскаміцэтаў. *С.І.Бельская.*

СФЕРАТЭ́КА (Sphaerotheca), род сумчатых грыбоў сям. мучністарасяных. Больш за 10 відаў. Пашыраны пераважна ў краінах з умераным кліматам. На Беларусі 8 відаў. Найб. вядомыя С.: агрэставая (S. mors-uvae), плямістая (S. macularis), чорная (S. fuliginea), лямцавая (S. pannosa). Паразіты культ. і дзікарослых раслін, узбуджальнікі пераважна *мучністай расы*.

Міцэлій паверхневы, павуціністы, лямцавы, ад шараватага да бурага колеру. Пладовыя целы (клейстатэцыі) цёмна-карычневыя, шарападобныя, утрымліваюць сумку з 6—8 спорамі. Сумкаспоры аднаклетачныя, эліпсоідныя, бясколерныя. *С.І.Бельская.*

СФЕРО́ІД (ад *сфера* + грэч. eidos выгляд), сплюшчаны *эліпсоід* вярчэння з малым сцісканнем; у больш агульным сэнсе — кожная паверхня, набліжаная да сферы. С. выкарыстоўваюць для характарыстыкі фігуры Зямлі (гл. *Геоід*).

СФЕРЫ́ЧНАЕ ЛЮСТЭ́РКА, выпуклае ці ўвагнутае *люстэрка*, якое мае форму сферычнага сегмента. Разам з *лінзамі* ўтварае люстрана-лінзавыя аптычныя сістэмы астр., фатагр. і інш. прылад.

Цэнтр сферычнай паверхні, з якой выразана С.л., — аптычны цэнтр люстэрка; любы прамень, што праходзіць праз яго, адбіваецца ад С.л. ў адваротным напрамку. Вяршыня сферычнага сегмента з'яўляецца полюсам люстэрка. Паралельны пучок прамянёў (ці іх працяг) пасля адбіцця ад С.л. збягаецца ў *фокусе* люстэрка. Выпуклае люстэрка заўсёды дае ўяўны зменшаны відарыс (гл. *Відарыс аптычны*) аб'екта, увагнутае — уяўны павялічаны відарыс, калі аб'ект знаходзіцца паміж полюсам люстэрка і яго фокусам, сапраўдны



Пабудова відарыса ва ўвагнутым **сферычным люстэрку**: C — полюс; F — галоўны фокус; O — аптычны цэнтр люстэрка; AB — аб'ект; A_1B_1 — яго відарыс.

павялічаны — калі паміж фокусам і аптычным цэнтрам і сапраўдны зменшаны — калі па-за аптычным цэнтрам. Увагнутыя С.л. выкарыстоўваюцца ў тэлескопах, пражэктарах, установах для зонная плаўкі і інш.

СФЕРЫ́ЧНАЯ АБЕРА́ЦЫЯ, гл. ў арт. *Аберацыі аптычных сістэм*.

СФЕРЫ́ЧНАЯ АСТРАНО́МІЯ, раздзел *астраметрыі*, які распрацоўвае матэм. метады вызначэння сапраўднага становішча і руху нябесных свяціл у касм. прасторы паводле іх бачных становішчаў і перамяшчэнняў на *нябеснай сферы*. Матэм. апарат С.а. — *сферычная трыганаметрыя*, асн. паняцце — нябесная сфера. Устанаўлівае сістэму *нябесных каардынат*, вызначае асн. элементы нябеснай сферы, распрацоўвае метады ўліку заканамерных змен нябесных каардынат у выніку *прэцэсіі*, *нутацыі*, *рэфракцыі* і *аберацыі святла*, паралактычных зрушэнняў, а таксама тэорыю вызначэння дакладнага часу. Дае магчымасць рашаць задачы *практычнай астраноміі*: вызначаць час і азімуты ўсходу і захаду Сонца, Месяца, зорак, геагр. каардынаты месца назірання і інш. *А.А.Шымбалёў.*

СФЕРЫ́ЧНАЯ ГЕАМЕ́ТРЫЯ, раздзел *геаметрыі*, які вывучае геаметрычныя

фігуры, размешчаныя на *сферы*, і іх уласцівасці. Узнікла ў 1—2 ст. н.э. з патрэб *сферычнай астраноміі*. З развіццём мараплаўства і геаграфіі С.г. сталі карыстацца таксама ў геадэзіі для вывучэння паверхні Зямлі.

Асн. панящі С.г. — пункты сферы, вял. кругі і рух сферы. Вял. кругі атрымліваюцца ад перасячэння сферы плоскасцямі, якія праходзяць праз яе цэнтр. Рух сферы — пераўтварэнне сферы, пры якім захоўваецца адлегласць паміж любымі яе пунктамі. У С.г. разглядаюцца трохвугольнікі (ці інш. фігуры), якія складаюцца з дуг вял. кругоў. Суадносіны паміж вугламі і старанамі сферычнага трохвугольніка вывучае *сферычная трыганаметрыя*.

СФЕРЫ́ЧНАЯ СІСТЭ́МА КААРДЫНА́Т, сукупнасць 3 лікаў r, θ, φ, якая вызначае становішча пункта ў прасторы. Уводзіцца наступным чынам. Калі пачатак прамавугольнай *дэкартавай сістэмы каардынат* пункт O супадае з цэнтрам сферы радыуса r, то сферычныя каардынаты пункта M: $r = OM$, $\theta = \angle MOz$, $\varphi = \angle xON$. З прамавугольнымі каардынатамі яны звязаны формуламі: $x = r \cdot \sin\theta \cdot \cos\varphi$, $y = r \cdot \sin\theta \cdot \sin\varphi$, $z = r \cdot \cos\theta$. Выкарыстоўваецца ў матэматыцы, астраноміі, фізіцы, тэхніцы.



Сферычная сістэма каардынат.

СФЕРЫ́ЧНАЯ ТРЫГАНАМЕ́ТРЫЯ, раздзел *трыганаметрыі*, дзе вывучаюць залежнасці паміж старанамі і вугламі сферычных трохвугольнікаў; матэм. апарат *сферычнай астраноміі*.

Вуглы A, B, C і процілеглыя ім стораны a, b, c сферычнага трохвугольніка звязаны асн. суадносінамі: $\frac{\sin(a/r)}{\sin A} = \frac{\sin(b/r)}{\sin B} = \frac{\sin(c/r)}{\sin C}$;



Да арт. **Сферычная трыганаметрыя**: O — цэнтр сферы; ABC — сферычны трохвугольнік са старанамі abc.

$\cos(c/r) = \cos(a/r)\cdot\cos(b/r) + \sin(a/r)\cdot\sin(b/r)\cdot\cos C$; $\sin(a/r)\cos B = \cos(b/r)\cdot\sin(c/r) - \sin(b/r)\cdot\cos(c/r)\cdot\cos A$, дзе r — радыус сферы. Гэтыя формулы дазваляюць па любых 3 зададзеных элементах трохвугольніка вызначыць 3 астатнія (рашыць трохвугольнік). Калі даўжыні старон малыя ў параўнанні з радыусам сферы, то іх знаходзяць па формулах плоскай трыганаметрыі, якія атрымліваюцца з дадзеных лімітнымі пераходамі.

СФЕРЫ́ЧНАЯ ХВА́ЛЯ, хваля, якая разыходзіцца радыяльна ад крыніцы ваганняў ці збягаецца да прыёмніка. *Фронт хвалі* — сфера.

Адрозніваюць сіметрычную С.х., што распаўсюджваецца ў аднародным непаглынальным асяроддзі, апісваецца ўраўненнем: $u(r,\ t) = \frac{A}{r}e^{i(\omega t \pm kr)}$, дзе A/r — амплітуда, $\omega t \pm kr$ — фаза хвалі, ω — кругавая частата, r — адлегласць ад крыніцы, $k = 2\pi/\lambda$ — хвалевы лік, λ — даўжыня хвалі), і несіметрычную С.х., якая мае сферычныя *хвалевыя паверхні*, *амплітуда* яе залежыць ад вуглавых каардынат (гл. *Сферычная сістэма каардынат*). Такія хвалі фарміруюцца звычайна ў аднародным асяроддзі на дастаткова вял. адлегласцях ад крыніцы хваль. Падборам вуглавога размеркавання інтэнсіўнасці можна сканцэнтраваць С.х. ўнутры пэўнага цялеснага вугла, што адбываецца, напр., у накіраваных антэнах.

СФЕРЫ́ЧНЫЯ ФУ́НКЦЫІ, спецыяльныя *функцыі*, якія ўзнікаюць пры вывучэнні фіз. з'яў у прасторавых абласцях, абмежаваных сферычнымі паверхнямі, а таксама пры рашэнні фіз. задач, што маюць сферычную сіметрыю. З'яўляюцца рашэннямі дыферэнцыяльнага ўраўнення, якое атрымліваецца пры раздзяленні пераменных у *Лапласа ўраўненні* ў сферычных каардынатах. Уведзены А.М.*Лежандрам* і П.С.*Лапласам*, маюць асн. дастасаванні ў тэорыі патэнцыялу ў матэм. фізіцы і механіцы.

СФЕРЫЯ́ЛЬНЫЯ (Sphaeriales), парадак сумчатых грыбоў. 18 сям., каля 5 тыс. відаў. Пашыраны ўсюды. Пераважна сапратрофы ў глебе, на арган. рэштках, некат. паразіты травяністых і дрэвавых раслін.

Пладовыя целы (перытэцыі) дыям. да 2 мм, акруглай ці грушападобнай формы, паверхневыя або крыху паглыбленыя ў субстрат ці строму. Абалонка (перыдый) шматслойная, цёмнага або чорнага колеру, вуглістая. Сумкі размешчаны на дне поласці перытэцыя, здольныя праз пору актыўна выкідваць споры наверх. Сумкаспоры адна- і шматклетачныя, разнастайнай афарбоўкі. У цыкле развіцця некат. С. адзначана канідыяльная стадыя (бясполае размнажэнне). *С.І.Бельская.*

СФІНГАЗІ́Н, вышэйшы аліфатычны ненасычаны *амінаспірт*; асн. структурны кампанент *сфінгаліпідаў*. Мае больш за 60 аналагаў і гамолагаў, якія адрозніваюцца колькасцю гідраксільных груп, ступенню ненасычанасці, даўж. вугляводароднага ланцуга, яго разгалінаванасцю. N-ацыльныя вытворныя С. (цэраміды) — важныя прамежкавыя злучэнні ў біясінтэзе сфінгаліпідаў. Ажыццяўлены хім. сінтэз С. і некат. яго аналагаў.

СФІНГАЛІПІ́ДЫ, клас складаных *ліпідаў*, структурныя кампаненты якіх — сфінгазінавыя асновы (*сфінгазін*, яго аналагі і гамолагі). Пашыраны ў расл. і жывёльных тканках, асабліва ў нервовай. Ва ўсіх прыродных С. сфінгазінавая аснова ацыліравана па амінагрупе астаткам вышэйшай тлустай к-ты (напр., с гэарынавай). У С., якія ўтрымліваюць фосфар (напр., сфінгаміэліны), першасны гідраксіл замяшчаецца астаткам фосфарнай к-ты. Парушэнне абмену С. у арганізме чалавека прыводзіць да захворванняў.

СФІНКС, 1) у старажытнаегіпецкай міфалогіі дух-ахоўнік, увасабленне царскай улады; фантастычная істота з целам ільва і галавою чалавека (звычайна партрэт фараона) або свяшчэннай жывёлы. 2) У старажытнагрэчаскай міфалогіі пачвара з тварам і грудзьмі жанчыны, целам ільва і крыламі птушкі, якую наслала *Гера* ў пакаранне на г. Фівы. Яна забівала кожнага, хто не мог адгадаць яе загадку. Загадку разгадаў *Эдып*, С. у роспачы кінулася ў бездань і разбілася. *А.Г.Зельскі.*



Сфінкс з Дэльфаў (Грэцыя). Мармур. 570—560 да н.э.

СФІНКТРЫ́НА (Sphinctrina), род накіпных лішайнікаў сям. каліцыевых. 14 відаў. Пашыраны ў Еўразіі і Паўн. Амерыцы. На Беларусі 1 від — С. ямістая (S. gelasinata), занесеная ў Чырв. кнігу. Селіцца на розных відах лішайнікаў з роду *пертузарыя* ў старых шыракалістых лясах.

Слаявіна непрыкметная, развіваецца ўнутры субстрату. Пладовыя целы (апатэцыі) на

ножках або сядзячыя, акруглай формы, чорныя, бліскучыя. Споры аднаклетачныя, шарападобныя, цёмнага колеру, па 8 у сумцы. Размнажэнне аскаспорамі. *У.У.Галубкоў.*



Сфінктрына ямістая.

СФІ́НКТЭР (ад грэч. sphinktēr сціскальнік), кругавая папярочна-паласатая або гладкая мышца, якая сціскае полы орган, замыкае натуральную адтуліну (напр., ротавую) або адтуліну пераходу з аднаго аддзела трубчастага органа ў другі; таксама мышцы, якія сціскаюць часткі цела або органа (напр., агульны сціскальнік шыі ў паўзуноў і млекакормячых).

СФО́РЦА (Sforza), дынастыя міланскіх герцагаў [1450—1535]. Родапачынальнік Муцыо Атэндола С. [1369—1424], селянін з Раманьі, празваны Сфорца за сваю сілу (італьян. sforzare адольваць сілай). Яго сын Франчэска С. (1401—66), кандацьер на службе ў Мілана, Фларэнцыі, Венецыі; зяць апошняга міланскага герцага з роду *Вісконці*. У 1450 авалодаў Міланам і стаў герцагам [1450—66]. Далучыў да Мілана б.ч. Ламбардыі, Бары, Геную; садзейнічаў ператварэнню Мілана ў культ. цэнтр, пры яго двары былі *Леанарда да Вінчы* і інш. Галеаца Марыя С. [1466—76] забіты прыхільнікамі рэспублікі. Джан Галеаца С. [1476—94] адхілены ад улады сваім дзядзькам Ладавіка С. па мянушцы Мора [Маўр; 1494—99], які, спадзеючыся аслабіць Неапаль і ўмацаваць сваю ўладу ў Мілане, садзейнічаў прыходу франц. войск Карла VIII у Італію (1494). У 1499 у выніку нар. паўстання Ладавіка С. выгнаны з Мілана. Яго сыны Масіміліяна С. (1493—1530) у 1512—15 і Франчэска II С. (1495—1535) у 1521—25 аднаўлялі ўладу роду С. ў Міланскім герцагстве. Пасля смерці Франчэска II дынастыя С. перастала існаваць; у 1535 Мілан увайшоў у склад уладанняў Іспаніі. Да роду С. належала каралева Польшчы і вял. княгіня літоўская *Бона Сфорца*.

СФРАГІ́СТЫКА (ад грэч. sphragis пячатка), сігілаграфія, спецыяльная гіст. навука, якая вывучае *пячаткі*. Разглядае пячаткі як самаст. помнікі гісторыі, а таксама як адзнакі сапраўднасці дакументаў, якія яны суправаджаюць. Матэрыялы С. — важныя крыніцы для вывучэння прыкладнога мастацтва, *геральдыкі*, *нумізматыкі*, *эпіграфікі*, *анамастыкі*, удакладнення складу стараж. архіваў. С. апісвае пячаткі, даследуе ўмовы і спосабы іх ужывання. Даследаванне сфрагістычнага матэрыялу дазваляе ўстанавіць час, месца паходжання і сапраўднасць дакумента, а таксама атрымаць дадатковыя звесткі пра падзеі ў краіне, міжнар. эканам. і культ. сувязі і інш. С. выкарыстоўвае агульныя метады і прыёмы гіст. навукі, распрацавала і ўласную спец. методыку. Агульная С. падзяляецца на С. стараж. свету, антычную, усходнюю, зах.-еўрапейскую і інш.

Асновы С. як навукі закладзены ў 17 ст. *маўрыстамі* — збіральнікамі і выдаўцамі сярэдневяковых рукапісаў у Францыі. У 18 ст. развівалася як аддзел *дыпламатыкі*. У Расіі вывучэннем пячатак займаліся М.І.*Навікоў* (18 ст.), М.М.*Карамзін*, Я.І.Бярэднікаў, А.Б.*Лакіёр* (19 ст.) і інш. У 1858 П.І.Іваноў надрукаваў зборнік здымкаў 500 рас. пячатак 14—18 ст., у 1894 К.В.Балсуноўскі выдаў кнігу пра драгічынскія *пломбы*. У пач. 20 ст. выйшлі працы А.В.Арэшнікава, А.А.*Шахматава*, М.І.Палянскага і інш. У наш час С. развівалі Б.А.*Рыбакоў*, М.Р.Парфірыдаў, М.П.*Ліхачоў* і інш. Бел. пячаткі ў 19—20 ст. вывучалі Лакіёр, К.Э.Напіерскі, К.М.Абаленскі, Ліхачоў, М.*Гумоўскі*, У.*Сямковіч* і інш. Бел. пячаткі з археал. раскопак вывучаюць М.Белямук, П.Ф.*Лысенка*, Г.В.*Штыхаў*, В.Л.*Янін* і інш., пячаткі пры дакументах — Э.Рымша, Г.Л.*Харашкевіч*, А.К.Цітоў і інш.

Літ.: Вспомогательные исторические дисциплины. Вып. 4. Л., 1972; Каменцева Е.И., Устюгов Н.В. Русская сфрагистика и геральдика. 2 изд. М., 1974; Белямук М. Вытокі беларускіх пячаткаў. Кліўленд, 1986; Соболева Н.А. Русские печати. М., 1991; Цітоў А. Пячаткі старажытнай Беларусі: Нарысы сфрагістыкі. Мн., 1993; Яго ж. Метадычныя парады па апісанню помнікаў сфрагістыкі для архіваў і музеяў. Мн., 1997; Яго ж. Сфрагістыка і геральдыка Беларусі: (Л. курс лекцый). Мн., 1999. *Г.В.Штыхаў.*

СФУМА́ТА (ад італьян. sfumato затуманены, дымчаты), у жывапісе і графіцы італьян. *Адраджэння* жывапісны прыём выкарыстання багацця і тонкасці градацый *святлацені*, якому ўласцівы мяккасць мадэліроўкі, няўлоўнасць прадметных абрысаў, адчуванне паветранага асяроддзя. Распрацаваны Леанарда да Вінчы.

СХАЛА́СТЫКА (лац. scholastica ад грэч. scholasticos школьны), сярэдневяковая філасофія, прадстаўнікі якой імкнуліся да тэарэт. абгрунтавання і сістэматызацыі хрысц. веравучэння. Найб. развіццё мела ў Зах. Еўропе. Схаласты імкнуліся ўмацаваць *хрысціянства* шляхам навук. абгрунтавання рэліг. светапогляду — сінтэзу асн. ідэй сусв. філасофіі і інтэрпрэтацыі іх зместу паводле канонаў хрысц. дагматыкі. Яны сцвярджалі, што пастулаты веры даступныя розуму і падтрымліваюцца лагічнымі доказамі. У межах С. абмяркоўваліся праблемы рэальнага быцця, суадносін мыслення і рэчаіснасці, агульных паняццяў (*універсалій*) і іх прыроды анталагічнага і гнасеалагічнага статуса. У аснову С. пакладзены вучэнні ант. мысліцеляў Платона, Арыстоцеля, араб. філосафаў Ібн Сіны, Ібн Рушда і інш. У эвалюцыі С. вылучаюць 3 перыяды: ранні, «класічны» і позні.

Ранняя С. (11—12 ст.; П.Абеляр, Гільём з Шампо, І.Расцэлін і інш.) развівалася пад уплывам *неаплатанізму*; у яе межах у т.зв. «спрэчцы пра універсаліі» вылучыліся 3 кірункі: *рэалізм*, *наміналізм*, *канцэптуалізм*. «Класічная» С. (12—13 ст.) знаходзілася пад уплывам філасофіі Арыстоцеля. Развівалася ў сяродневяковых ун-тах; яе цэнтр — Парыжскі ун-т. У «класічнай» С. вылучыліся «артадаксальны» кірунак, які пры дапамозе анталогіі Арыстоцеля абгрунтоўваў існаванне душы (*Альберт Вялікі*, *Фама Аквінскі*) і «ератычны» (*авераізм*), які адмаўляў асабістую душу і сцвярджаў, што існуе толькі адзіная безасабовая душа. Позняя С. (13—14 ст.; І.Дунс Скот, У.Окам і інш.) характарызуецца адыходам ад рацыяналізму ў абгрунтаванні рэліг. светапогляду, валюнтарызмам, крытыкай вучэння Фамы Аквінскага, прызнаннем супярэчнасці паміж рэліг. і рацыянальным пазнаннем (тэорыя дваістасці ісціны). У эпоху Адраджэння С. перажывае крызіс. Новы ўздым С. адбыўся ў часы Контррэфармацыі, гал. чынам у Іспаніі (Ф. дэ Віторыя, Ф.Суарэс, Г.Васкес, М.Маліна і інш.). У эпоху Асветніцтва ідэі С. трацяць свае пазіцыі. Аднаўленне схаластычных традыцый рацыянальнага абгрунтавання рэліг. ісціны з канца 19 ст. звязана з філасофіяй *неатамізму*.

Літ.: Время, истина, субстанция: от антич. рациональности к средневековой. М., 1991; Реале Дж., Антисери Д. Западная философия от истоков до наших дней: Пер. с итал. Кн. 2. СПб., 1994; Абеляр П. Теологические трактаты: Пер. с лат. М., 1995; Неретина С.С. Верующий разум: К истории средневековой философии. Архангельск, 1995; Коплстон Ф.Ч. История средневековой философии: Пер. с англ. М., 1997; Антология философии Средних веков и эпохи Возрождения. М., 2001. *В.І.Боўш.*

СХЕ́МА (ад грэч. schēma вобраз, форма), 1) спрошчаны чарцёж, на якім умоўнымі графічнымі знакамі перададзена (без захавання маштабу) пабудова, сістэма, узаемаразмяшчэнне і сувязь частак якой-н. прылады, збудавання і інш. 2) Апісанне, павярхоўны паказ чаго-н. у агульных рысах; папярэдні накід, агульная формула і інш. (напр., С. артыкула).

СХЕМАТЫ́ЗМ (ад грэч. schematismos абрысы, форма), спрошчанасць у адлюстраванні чаго-н., схільнасць мысліць трафарэтна, гатовымі *схемамі*.

СХЕМАТЭ́ХНІКА, навукова-тэхнічны кірунак, які ахоплівае праблемы сінтэзу схем электронных прылад радыётэхнікі, сувязі, аўтаматыкі, выліч. тэхнікі і інш. з мэтай аптымальнага выканання імі зададзеных функцый. Грунтуецца на тэорыі эл. ланцугоў, электрадынаміцы, тэорыі аўтаматаў, матэм. мадэліравання і інш.

Прадугледжвае распрацоўку структуры прылад з улікам спецыфікі іх функцыянавання, іх схем і разлік параметраў элементаў, з

якіх складаецца прылада, і функцыянальных сувязей паміж імі, а таксама вызначэнне аптымальнага рэжыму работы. Для рашэння задач С. карыстаюцца *сістэмамі аўтаматызаванага праектавання*. Гл. таксама *Мікраэлектроніка, Мініяцюрызацыя*.

СХЕНК (Schenk) Адрыянус (Ард; н. 16.9.1944, Ганна Паўлаўна, Нідэрланды), галандскі спартсмен (скорасны бег на каньках). Чэмпіён XI зімовых Алімп. гульняў (1972, г. Сапара, Японія) на дыстанцыях 1500, 5000 і 10 000 м; сярэбраны прызёр X Алімп. гульняў (1968, г. Грэнобль, Францыя) на дыстанцыі 1500 м. Чэмпіён свету (1970—72) у мнагабор'і, у 1967 — на дыстанцыі 1500 м; сярэбраны (1966, 1967) і бронз. (1965, 1968) прызёр. Чэмпіён Еўропы (1966, 1970, 1972) у мнагабор'і і на асобных дыстанцыях; сярэбраны прызёр (1971). Бронз. прызёр чэмпіянатаў свету па спрынтэрскім бегу на каньках (1971, 1972). 15-разовы рэкардсмен свету (1966—68, 1971—78).

А.М.Петрыкаў.

СХІ́ЗМА (грэч. schisma раскол), раскол у выніку супярэчнасцей унутры хрысц. царквы. У Новым Запавеце гэта панятце ўвогуле азначае царк. падзелы і разлады. Найчасцей пад С. разумеецца канфлікт паміж зах. і ўсх. хрысц. цэрквамі, які пачаўся ў 867 і прывёў у 1054 да падзелу *хрысціянства* на каталіцызм і праваслаўе (гл. *Падзел цэркваў*). У сярэднія вякі ў Зах. Еўропе С. таксама называлі выпадкі адначасовага абрання 2 ці 3 *пап рымскіх*, асабліва ў перыяд 1378—1418 («Вялікая С.»).

СХІЛЕ́ННЕ, гл. ў арт. *Нябесныя каардынаты*.

СХІЛЕ́ННЕ МАГНІ́ТНАЕ, вугал паміж геагр. і магн. мерыдыянамі ў пэўным пункце зямной паверхні. Бывае ўсходняе (дадатнае), калі паўн. канец магн. стрэлкі адхілены на У ад геагр. мерыдыяна, і заходняе (адмоўнае) — калі на З. Улічваецца пры дакладным арыентаванні на мясцовасці па компасе ці бусолі. На Беларусі С.м. ўсходняе да 5°. Гл. таксама *Магнітнае поле Зямлі, Зямны магнетызм, Нахіленне магнітнае*.

СХІ́ЛЫ, нахіленыя ўчасткі зямной паверхні, што фарміруюцца ў выніку эндагенных і экзагенных працэсаў на сушы (у гарах, далінах, катлавінах, на ўзвышшах), а таксама на дне мораў і акіянаў (*мацерыковы схіл, падводныя хрыбты* і ўзвышшы). Характар С. вызначаецца складам і будовай парод, абсалютнымі і адноснымі вышынямі, асаблівасцямі клімату, глеб, расліннасці, іх экспазіцыяй, інтэнсіўнасцю схілавых працэсаў. Паводле паходжання вылучаюць тэктанічныя, дэнудацыйныя, акумулятыўныя, складаныя; паводле формы — прамыя, пукатыя, увагнутыя, складанай будовы; паводле стромкасці — слабаспадзістыя (нахіл 1—3°), спадзістыя (3—5°), слабапакатыя (5—7°), пакатыя (7—10°), стромкія (10—15°), вельмі стромкія (15—20°). На Беларусі каля 50% ворных зямель размешчана на С.

СХО́ВІШЧА, спецыяльна абсталяванае збудаванне, памяшканне, месца ў будынку ці ў інш. аб'екце для захоўвання, зберагання, укрыцця чаго-небудзь. 1) У сельскай гаспадарцы С. выкарыстоўваюць для захоўвання бульбы (*бульбасховішчы*), сенажу (*сянажныя сховішчы*), сіласу (*сіласасховішчы*), каранеклубняплодаў (найпрасцейшыя — *капцы*).

С. для агародніны — наземныя або заглыбленыя будынкі, збудаванні для захоўвання буракоў, морквы, капусты, цыбулі і інш. Сцены іх робяць з бетонных блокаў, уцепленых жалезабетонных панэлей, цэглы, каменю. Для аховы ад прамярзання сцены і дах уцяпляюць, у заглыбленых — абвалоўваюць зямлёй. Для належнага рэжыму захоўвання С. абсталёўваюць сістэмамі вентыляцыі, аўтам. тэрмарэгулятарамі.

2) Ва ўстановах культуры С. — асобыя памяшканні ў архіве, бібліятэцы, музеі для захоўвання рукапісаў, рэдкіх кніг, калекцый і да т.п., а таксама гэтыя ўстановы як цэнтры сабраных каштоўнасцей. 3) Укрыцце ад снарадаў, бомбаў, атрутных рэчываў і інш., спецыяльна збудаванае або абсталяванае ў падвалах жылых і грамадз. будынкаў з трывалымі перакрыццямі і сценамі (гл. *Сховішча* ваеннае).

В.М.Кандрацьеў.

СХО́ВІШЧА вайсковае, спецыяльнае збудаванне закрытага тыпу, прызначанае для засцярогі людзей ад сродкаў паражэння. Паводле прызначэння падзяляюцца на вайсковыя і *грамадзянскай абароны*. Вайск. С. класіфікуюцца паводле ступені засцярогі, выкарыстаных матэрыялаў, канструкцый і спосабаў узвядзення. Бываюць лёгкага і цяжкага тыпу. Для засцярогі асабовага складу на баявых пазіцыях, *пунктах камандных, назіральных пунктах* і інш. С. будуюць катлаванным і падземным спосабамі з мясц. матэрыялаў або элементаў і канструкцый прамысл. вырабу. Найчасцей складаюцца з асн. памяшкання для асабовага складу і 1—2 уваходаў (выхадаў). Звычайна абсталяванне вайск. С. засцерагае людзей ад атрутных і радыеактыўных рэчываў, бактэрыяльных сродкаў і інш. С. грамадз. абароны размяшчаюцца, як правіла, у вытв., дапаможных, жылых, грамадскіх будынках і нар.-гасп. аб'ектах (звычайна заглыбленых). У якасці С. могуць выкарыстоўвацца станцыі метро і аб'екты інш. падземных камунікацый. Гл. таксама *Ахоўныя збудаванні*.

С.А.Фамін.

СХОД ГРАМАДЗЯ́Н, форма непасрэднага ўдзелу грамадзян у ажыццяўленні мясц. самакіравання. Парадак скліканя і правядзення С.г., прыняцця і змены яго рашэнняў устаноўлены Законам «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні ў Рэспубліцы Беларусь» 1995. Па меры неабходнасці С.г. склікаюць мясц. Саветы дэпутатаў, іх органы, выканкомы ці органы тэр. грамадскага кіравання. На іх абмяркоўваюць пытанні дзярж. і мясц. значэння, прымаюць рашэнні па непасрэднай рэалізацыі пастаноў органаў мясц. самакіравання; маюць права звяртацца з прапановамі ў мясц. Саветы і іх органы, інш. дзярж. і грамадскія органы, прадпрыемствы, арг-цыі і ўстановы; правамоцныя прымаць рашэнні аб датэрміновым роспуску органаў тэр. грамадскага самакіравання, калі яны не выконваюць належным чынам свае функцыі. Гл. таксама *Мясцовае кіраванне і самакіраванне*.

Г.А.Маслыка.

«СХОД РУ́СКІХ ФАБРЫ́ЧНА-ЗАВО́ДСКІХ РАБО́ЧЫХ САНКТ-ПЕЦЯРБУ́РГА», легальнае рабочае т-ва ў С.-Пецярбургу ў 1903—05. Засн. з дазволу ўлад і пры тайным удзеле паліцыі на ўзор зубатаўскіх арг-цый (гл. *Зубатаўшчына*) святаром Г.А.*Гапонам*. Паводле Статута (зацверджаны 28.2.1904) яго членамі маглі быць рабочыя толькі рус. паходжання і хрысц. веравызнання. Т-ва мела 11 раённых аддзяленняў, аб'ядноўвала да 10 тыс. чал. Яно вяло сярод рабочых культ.-асв. работу, прапагандавала ідэі адданасці цару і царкве, класавага міру і хрысц. сацыялізму, імкнулася скіраваць барацьбу рабочых за свае правы ў мірнае рэчышча. Аднак пад уплывам эканам. крызісу і выкліканага ім рэв. ўздыму дзейнасць «Сходу» насупераку волі яго кіраўнікоў паступова палітызавалася. У студз. 1905 яго аддзяленні сталі цэнтрамі агульнагар. стачкі. Па ініцыятыве Гапона была выпрацавана петыцыя да цара, куды пад уплывам сацыял-дэмакратаў уключаны паліт. і эканам. патрабаванні (скліканне Устаноўчага сходу, увядзенне дэмакр. свабод, 8-гадзіннага рабочага дня і інш.) і 9(22).1.1905 арганізавана мірнае шэсце да Зімняга палаца, якое скончылася масавым расстрэлам рабочых (гл. «*Крывавая нядзеля*»); «Сход» распушчаны ўладамі.

СЦВІ́ГА, рака ў Ровенскай вобл. Украіны, Столінскім р-не Брэсцкай і Жыткавіцкім р-не Гомельскай вобл. Беларусі, правы прыток р. Прыпяць. Даўж. 178 км, пл. вадазбору 5,3 тыс. км^2; у межах Беларусі адпаведна — 112 км і 4,3 тыс. км^2. Пачынаецца ў Ракітнаўскім р-не Ровенскай вобл., вусце за 2 км на ПнУ ад в. Пагост Жыткавіцкага р-на. Цячэ ў межах Прыпяцкай нізіны. Даліна ў вярхоўі трапецападобная, шыр. 0,5—1 км, ніжэй невыразная, зліваецца з прылеглай мясцовасцю. Пойма двухбаковая, роўная, пераважна забалочаная. Рэчышча свабодна меандруе, моцнавілістае, разгалінаванае, у вярхоўі каналізаванае, шыр. ў ніжнім цячэнні 20—30 м. Прымае сцёк з сеткі меліярац. каналаў.

«СЦВЯРДЖА́ЛЬНІКІ НО́ВАГА МАСТА́ЦТВА» («Утвердители нового искусства», УНОВИС), суполка мастакоў-наватараў, утвораная 14.2.1920 у Віцебскай маст. школе пад кіраўніцтвам К.*Малевіча* і Л.*Лісіцкага*. У яе ўваходзілі педагогі і навучэнцы В.Ермалаева, М.Коган, І.Чашнік, М.Суэцін, Л.Хідэкель. Сваёй праграмай творчай дзейнасці ставілі радыкальную перамену свету рэчаў па прынцыпах *супрэма-*

тызму. Праграма суполкі абгрунтавана ў маніфесце, надрукаваным у газ. «Известия Витебского губернского Совета крестьянских, рабочих, красноармейских и батрацких депутатов» (17.3.1920). Філіялы УНОВИС былі арганізаваны ў Смаленску, Маскве, Самары, Сараташе, Адэсе і інш. У Віцебску была пастаўлена футурыстычная опера «Перамога над сонцам» (1920), праводзілася супрэматычнае афармленне горада да свят, канферэнцый, сходаў, выконваліся рэкламнае афармленне трамваяў, шматлікія праекты прыкладной графікі, сцэнаграфіі, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, архітэктурных праектаў, літаграфскім спосабам выдаваліся тэарэт. матэрыялы. У 1922 Малевіч з найб. актыўнымі членамі суполкі ад'ехалі ў Петраград, і суполка распалася. Асобныя палажэнні праграмы выкладзены у «Супрэматысцкім маніфесце Уновіса» (1924, Ленінград). Прынцыпы УНОВИС паўплывалі на кніжную і прыкладную графіку, афармленне выставак на Беларусі; на першых Усебел. выстаўках дэманстраваліся творы супрэматычнага кірунку. З 1994 перыядычна праводзіцца міжнар. пленэр «Малевіч. УНОВИС. Сучаснасць».

Літ.: Великая утопия: Рус. и сов. авангард, 1915—1932: [Каталог]. Берн. М., 1993; Налайко Л.Д. К истории художественной жизни Витебска (1918—1922 гг.). Витебск, 1994. *Я.Ф.Шунейка.*

СЦЕ́БУТ Іван Аляксандравіч (12.2.1833, г. Вял. Лукі Пскоўскай вобл., Расія — 20.10.1923), рускі і бел. вучоны-аграном, адзін з заснавальнікаў раслінаводства на Беларусі. Скончыў Горы-Горацкі земляробчы ін-т (1854), з 1860 праф. гэтага ін-та. У 1865—94 праф. Пятроўскай земляробчай і лясной акадэміі, узначальваў 1-ю ў Расіі кафедру раслінаводства. Навук. працы па апрацоўцы глебы, агратэхніцы палявых культур. Арганізатар першай у Расіі жаночай вышэйшай с.-г. навучальнай установы (Сцебутаўскіх курсаў). Заснавальнік і рэдактар журнала «Русское сельское хозяйство».

Тв.: Изб. соч. Т. 1—2. М., 1956—57.



І.А.**Сцебут**.

СЦЕНАВЫ́Х МАТЭРЫЯ́ЛАЎ ПРАМЫСЛО́ВАСЦЬ, галіна прамысловасці буд. матэрыялаў па выпуску вырабаў, якія выкарыстоўваюцца пры ўзвядзенні сцен будынкаў. Уключае прадпрыемствы па выт-сці сценавых, абліцовачных і аддзелачных матэрыялаў, вырабаў і канструкцый, асабліва бетонных і жалезабетонных, цэглы для ўзвядзення будынкаў і збудаванняў. З развіццём прадукцыйных сіл адасобілася ў самастойную галіну цяжкай індустрыі. Сканцэнтравана ў межах буд. індустрыі, усе яе галіны цесна ўзаемазвязаны і ўтвараюць спецыфічныя індустр.-буд. тэр. спалучэнні. У капітальным буд-ве найб. пашыраны каменныя сценавыя матэрыялы, якія звычайна падзяляюцца на драбнаштучныя, што ўкладваюцца ўручную [гліняная і сілікатная цэгла, керамічныя шматпустотныя бетонныя і шлакабетонныя камяні, пілаваныя камяні з лёгкіх горных парод (туф, вапняк)], і буйнапамерныя (блокі са звычайнага, лёгкага або сілікатнага бетону, сценавыя панэлі). Пры буд-ве сцен малапавярховых будынкаў, часовых пабудоў і інш. выкарыстоўваюцца танныя мясц. матэрыялы. Размяшчэнне С.м.п. арыентуецца на крыніцы прыроднай сыравіны і раёны капітальнага буд-ва.

Адносна лёгкія ўмовы здабычы і высокае ўтрыманне кампанентаў робіць мінер.-буд. сыравіну даволі таннай, яна, як правіла, не патрабуе папярэдняга абагачэння. Многія сценавыя матэрыялы (жалезабетонныя вырабы і канструкцыі, цэгла і інш.) маюць параўнальна невысокі кошт і вял. аб'ёмную вагу і з-за гэтага — нізкую транспартабельнасць, меншую, чым зыходная сыравіна. Неабходнасць скарачэння трансп. выдаткаў патрабуе набліжэння С.м.п. да месцаў спажывання.

У дарэв. Беларусі асн. сценавым матэрыялам была цэгла, якую выраблялі на малых з-дах. Найбольшыя цагельні дзейнічалі ў Мінску, адносна буйныя — у Брэсце, Віцебску, Гомелі, Гродне, Магілёве, невялікія — у Бабруйску, Полацку, Лідзе, Оршы, Рагачове, Кобрыне. У 1913 выраблена 58 млн. штук цэглы. У 1920—30-я г. цагельні рэканструяваны, пабудаваны новыя з-ды па выпуску глінянай і сілікатнай цэглы, з'явіліся выт-сці і тэхналогіі, якіх раней не было (выпуск арміраваных пенасілікатных і сілікатабетонных блокаў і панэлей, сценавых аглапарытавых панэлей і інш.). Склалася спецыялізацыя асобных прадпрыемстваў галіны. Буйныя прадпрыемствы засяроджаны ў Мінску і абл. цэнтрах, Салігорску, Оршы, Клімавічах, Смаргоні і інш. У 2000 С.м.п. выраблена 0,8 млрд. штук цэглы, 1,7 млн. $м^3$ зборных жалезабетонных канструкцый і вырабаў, 0,1 млрд. штук умоўных блокаў, 8,9 млн. $м^2$ керамічнай пліткі і інш. Цэглу выраблюць больш як на 200 прадпрыемствах, з іх асноўныя: Брэсцкі, Віцебскі, Гарынскі, Гродзенскі, Клімавіцкі, Мінскі, Полацкі камбінаты буд. матэрыялаў, Мінскі, Магілёўскі, Аршанскі камбінат зборных жалезабетонных вырабаў і канструкцый, аб'яднанне «Смаргоньсілікатабетон», Обальскі керамічны завод і інш. Гл. таксама *Будаўнічых матэрыялаў прамысловасць.* *Г.С.Смалякоў.*



Рака **Сцвіга** ў ніжнім цячэнні.

СЦЕНАВЫ́Я МАТЭРЫЯ́ЛЫ, разнавіднасць *будаўнічых матэрыялаў*, з якіх узводзяць сцены будынкаў (збудаванняў).

Адрозніваюць С.м.: неарганічныя (гліняная і сілікатная *цэгла*, камяні керамічныя, з лёгкага бетону і прыродныя пілаваныя, *блокі* і *панэлі* з сілікатнага і цэментнага бетону, *шклаблокі* і *шклопрафіліт*, панэлі з азбестацэменту, анадзіраванага алюмінію, металапластаў і інш. ліставых матэрыялаў з уцяпляльні-

камі), арганічныя (драўняныя — бярвёны, брусы, шчыты, а таксама пліты на аснове чароту, саломы, торфу), С.м. на аснове мінер. вяжучых рэчываў і арган. запаўняльнікаў (*арболіт*, *фібраліт*). Маюць дастатковую трываласць, вогнеўстойлівасць, нізкую цепла- і гукаправоднасць. Гл. таксама *Каменныя матэрыялы і канструкцыі*.

СЦЕПАНАКЕ́РТ, армянская назва г. *Ханкэнды*, адм. цэнтра Нагорнага Карабаха. Названы ў гонар С.Г.*Шаўмяна* ў 1923.



А.В.**Сцепаненка**.



М.Ц.**Сцепанішчаў**.

СЦЕПАНЕ́НКА Аляксандр Васілевіч (н. 5.10.1938, г. Орша Віцебскай вобл.,), бел. вучоны ў галіне апрацоўкі металаў. Акад. Нац. АН Беларусі (1986, чл.-кар. 1980), д-р тэхн. н. (1974), праф. (1977). Засл. дз. нав. і тэхн. Беларусі (1988). Скончыў БПІ (1961) і з 1963 працаваў у ім (з 1976 прарэктар, адначасова з 1975 заг. кафедры). З 1987 віцэ-прэзідэнт АН Беларусі, з 1992 у Фізіка-тэхн. ін-це Нац. АН Беларусі (заг. аддзялення). Навук. працы па праблемах інтэнсіфікацыі працэсаў апрацоўкі металаў ціскам пры выкарыстанні ультрагуку, рэсурсазберагальных працэсах апрацоўкі матэрыялаў. Распрацаваў спосабы і абсталяванне для бесперапыннага фармавання метал. парашкоў і гранул, спосабы апрацоўкі металаў ціскам з выкарыстаннем актыўных сіл трэння і вібрацыйнага нагружэння, атрымання вырабаў пераменнага сячэння, высокаскаснога валачэння профіляў. Дзярж. прэмія Беларусі 1984.

Тв.: Обработка металлов давлением с ультразвуком. Мн., 1973 (разам з В.П.Севярдзенкам, У.У.Клубовічам); Ультразвук и пластичность. Мн., 1976 (з імі ж); Непрерывное формование металлических порошков и гранул. Мн., 1980 (разам з Л.А.Ісаевічам).

СЦЕПАНЕ́НКАЎ Мікалай Капітонавіч (н. 31.10.1925, в. Харына Духаўшчынскага р-на Смаленскай вобл., Расія), бел. вучоны ў галіне педагогікі. Д-р пед. н. (1988), праф. (1974). Акад. Рас. акадэміі праф. адукацыі (1998). Скончыў Смаленскі пед. ін-т (1951). Працаваў дырэктарам сярэдняй школы. З 1962 у Гродзенскім пед. ін-це, з 1974 у Бел. пед. ун-це. Даследуе праблемы політэхн. адукацыі і прафарыентацыі навучэнцаў, пед. адукацыі настаўніцкіх кадраў. Аўтар вучэбных дапаможнікаў, навукова-метадычных прац.

Тв.: Политехнические основы подготовки учащихся к труду. Мн., 1982; Профессиональная ориентация учащихся. Мн., 1993; Планирование работы классного руководителя. Мн., 1996; Педагогика. 2 изд. Мн., 2001.

СЦЕПАНІ́ШЧАЎ Міхаіл Ціханавіч (12.12.1917, в. Першае Колесава Задонскага р-на Ліпецкай вобл., Расія — 8.9.1946), удзельнік вызвалення Беларусі. Двойчы Герой Сав. Саюза (1944, 1945). Скончыў Варашылаўградскую ваен. авіяц. школу (1938). У Чырв. Арміі з 1937. У Вял. Айч. вайну лётчык, камандзір звяна, эскадрыллі, штурман і нам. камандзіра штурмавога авіяц. палка на Паўд., Сталінградскім, Паўд.-Зах., 4-м Укр. і 3-м Бел. франтах; у чэрв.—ліп. 1944 штурмаваў варожыя пазіцыі ў раёнах Оршы, Віцебска, Полацка. Вызначыўся пры ліквідацыі праціўніка ў раёне Кёнігсберга. Здзейсніў 234 баявыя вылеты.

СЦЕПАНКО́Ў Канстанцін Пятровіч (н. 3.6.1928, с. Печаскі Хмяльніцкай вобл., Украіна), украінскі акцёр. Нар. арт. СССР (1977). Скончыў Кіеўскі ін-т тэатр. мастацтва (1953). У 1955—68 у Кіеўскім т-ры імя Франко. Мастацтва С. адметнае псіхал. глыбінёй, вастрынёй і дакладнасцю малюнка ролі. З 1957 здымаецца ў кіно. Сярод лепшых роляў у кіно: Фёдар Лабачоў («Камісары», 1971), Фёдар Жухрай («Як гартавалася сталь», 1973), Каўпак («Дума пра Каўпака», 1974—78). Зняўся таксама ў фільмах: «Дзесяты крок» (1967), «Каменны крыж» (1968), «Сям'я Кацюбінскіх» (1971), «Мора» (1979), «Легенда пра княгіню Вольгу» (1983).

СЦЕПАНЦЭ́ВІЧ Калерыя Іосіфаўна (н. 21.3.1926, г. Ніжні Ноўгарад, Расія), бел. музыказнавец, педагог. Засл. работнік вышэйшай школы Беларусі (1977). Канд. мастацтвазнаўства (1982). Праф. (1982). Скончыла Маскоўскі муз.-пед. ін-т імя Гнесіных (1953). З 1945 выкладчык муз. навуч. устаноў у Горкім і Маскве, з 1957 — Бел. акадэміі музыкі (у 1963—86 прарэктар, заг. кафедры, з 1987 праф.). Даследуе праблемы муз. выхавання і адукацыі, выканальніцтва, творчасць рус. і бел. кампазітараў. Аўтар прац: «Варыяцыйнасць у опернай творчасці М.І.Глінкі» (1966), «Новыя тэндэнцыі ў развіцці беларускага музычнага мастацтва: (Канец 50-х — першая палова 70-х гг.)» (1981). Сааўтар «Гісторыі беларускай савецкай музыкі» (1971), «Гісторыі беларускай музыкі» (М., 1976) і інш. Складальнік кн. «З гісторыі музыказнаўства ў Беларусі: Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі, 1932—1992» (2002), складальнік і рэдактар н.-д. зб-каў «Пытанні музыказнаўства» (1981), «Даследаванні пра музыку» (1985), метадычных дапаможнікаў, праграм для дзіцячых муз. школ, ВНУ.

М.Р.Солапаў.

СЦЕПАНЧУ́К Кліменцій Піліпавіч (н. 25.10.1932, Мінск), бел. вучоны ў галіне электратэхнікі. Д-р тэхн. н. (1993), праф. (1994). Скончыў БПІ (1956). З 1962 у Бел. нац. тэхн. ун-це. Навук. працы па разліку, канструяванні і эксплуатацыі высакавольтнай ізаляцыі машын і апаратаў, кантролю і дыягностыцы эл. ізаляцыі, экалагічных праблемах высакавольтнай тэхнікі. Распрацаваў метады ацэнкі эл. трываласці і часу жыцця сістэм камбінаванай ізаляцыі, метады рацыянальнага планавання даследаў і паскораных выпрабаванняў высакавольтнай ізаляцыі.

Тв.: Техника высоких напряжений. 2 изд. Мн., 1982 (разам з М.А.Ціняковым); От 1000 до 1 500 000 вольт. Мн., 1985.

СЦЕПАНЮ́К Барыслаў Паўлавіч (н. 16.7.1923, с. Канеўшчына Прылуцкага р-на Чарнігаўскай вобл., Украіна), украінскі паэт і перакладчык. Засл. работнік культ. Кіргізіі (1975). Засл. работнік культ. Чувашыі (1979). Засл. работнік культ. Украіны (1983). Скончыў Кіеўскі ун-т (1947). Друкуецца з 1943. Матывамі дружбы народаў, ідэямі патрыятызму і інтэрнацыяналізму прасякнуты кнігі «Насустрач вёснам» (1948), «Бацькоўскі ачаг» (1955), «У палявым вянку» (1963), «Імем сонца» (1966), «Баладны лад» (1972), «Пяць пялёсткаў агню» (1980). Беларусі прысвяціў вершы «Ой, ляцелі гусі з Беларусі», «Песня Янкі Купалы», «Матчына мова» і інш. Пераклаў на ўкр. мову паэмы В.Таўлая «Таварыш», А.Вялюгіна «Вецер з Волгі», паасобныя вершы М.Багдановіча, Р.Барадуліна, З.Бядулі, У.Дубоўкі, К.Кірэенкі, А.Куляшова, Е.Лось, М.Танка і інш. На бел. мову яго вершы перакладалі Барадулін, А.Бялевіч, В.Вольскі, Ю.Голуб, С.Грахоўскі, Х.Жычка, Кірэенка, Г.Пашкоў, П.Прыходзька, А.Пысін, Ю.Свірка і інш. Складальнік анталогіі на бел. мове «Украінская савецкая паэзія» (т. 1—2, 1975).

Тв.: Вибрані твори. Т. 1—2. Київ, 1983; Обпалена всіма вітрами. Київ, 2000; Бел. пер. — Матчына слова. Мн., 1977.

Літ.: Р а г о й ш а В.П. Вяртанне ў матчыну мову // Кантакты. Мн., 1982.

СЦЕПЯНЁЎСКІ БЕРАГАВЫ́ ЎСТУ́П, геалагічны помнік прыроды рэсп. значэння (з 1997). Размешчаны каля паўд. ускраіны б. в. Сцепянёва Мядзельскага р-на Мінскай вобл., на зах. беразе воз. Нарач. Выш. да 8 м, стромкасць схілаў 80—45°. Берагавы ўступ (абразійны кліф) утварыўся каля 11 тыс. г. назад у выніку хвалепрыбойнай дзейнасці возера і разбурэння высокага пясчанага берага.

В.Ф.Вінакураў.

СЦЕ́РЖАНЬ, возера ў Чашніцкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Свячанка, за 15 км на У ад г. Чашнікі. Пл. 1,68 км^2, даўж. 1,8 км, найб. шыр. 1,4 км, найб. глыб. 1,8 м, даўж. берагавой лініі 5,3 км. Катлавіна рэшткавага тыпу, размешчана сярод нізіннага балота. Схілы невыразныя. Берагі сплавінныя, параслі трыснягом, асокамі, хмызняком. Дно выслана сапрапелем. Зарастае падводнай расліннасцю. Упадаюць рэкі Свяча, Рагожыца, сцёк па р. Свячанка.

СЦЕ́РЖАНЬ, возера ў Чашніцкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Лукомка, за 18 км на Пд ад г. Чашнікі. Пл. 0,5 км^2, даўж. 1,3 км, найб. шыр. 400 м, даўж. берагавой лініі 3,2 км, пл. вадазбору 22,6 км^2. Катлавіна лагчыннага тыпу. Схілы выш. да 10 м, у канцавых ч. возера невыразныя. Вылучаецца пойма, якая пераходзіць у даліны ручаёў. Упадаюць 2 ручаі, сцёк па меліярац. канаве ў р. Лукомка.

СЦЕ́РЛЯДЗЬ (Acipenser ruthenus), рыба сям. асятровых атр. асетрападобных. Адзіны з прамысл. прэснаводных асятровых. Пашыраны ў рэках бас. Каспійскага, Азоўскага, Чорнага мораў, трапляецца ў рэках Паўн. Дзвіна, Об, Іртыш, Енісей; на Беларусі — у р. Дняпро, радзей у Прыпяці, Сажы, Бярэзіне. Занесена ў Чырв. кнігу. Гібрыд *бялугі* і С. — *бесцер*, завезены на Беларусь у 1973.

Даўж. да 125 см (звычайна 40—60), маса да 16 кг (0,5—2). Цела выцягнутае, верацёнападобнае, укрытае дробнымі касцявымі пласцінкамі. Уздоўж тулава цягнуцца 5 радоў буйных касцявых пласцінак (жучак). Рыла падоўжанае, канічнае, знізу наперадзе рота 4 махрыстыя ← вусікі. ← Хваставы ← плаўнік асіметрычны, канец пазваночніка загінаецца ў яго доўгую верхнюю лопасць. Корміцца дробнымі донными беспазваночнымі. Аб'ект промыслу і развядзення.



Сцерлядзь.

СЦЕ́РНІК, Бусоўня, возера ў Гарадоцкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Обаль, за 36 км на ПнЗ ад г. Гарадок. Пл. 0,28 км^2, даўж. 800 м, найб. шыр. 400 м, даўж. берагавой лініі 2,1 км, пл. вадазбору 2,5 км^2. Схілы катлавіны выш. да 5 м, месцамі невыразныя, параслі лесам, на Пн разараныя.

СЦЕ́ЧКІН Барыс Сяргеевіч (5.8.1891, с. Труфанава Тульскай вобл., Расія — 2.4.1969), савецкі вучоны ў галіне гідраэрамеханікі і цеплатэхнікі. Акад. АН СССР (1953, чл.-кар. з 1946). Герой Сац. Працы (1961). Скончыў Маскоўскае вышэйшае тэхн. вучылішча (1918), выкладаў у ім (1918—27) і Маскоўскім авіяц. ін-це (1933—37). Разам з М.Я.*Жукоўскім* удзельнічаў у стварэнні Цэнтр. аэрагідрадынамічнага ін-та (ЦАГІ). У 1954—61 заг. лабараторыі рухавікоў, пераўтворанай (1961) у Ін-т рухавікоў АН СССР (у 1961—62 яго дырэктар). Адначасова ў 1954—69 праф. Маскоўскага аўтамабільна-дарожнага ін-та. Стварыў тэорыю цеплавога разліку авіяц. рухавікоў, методыкі пабудовы іх характарыстык, тэорыю паветранарэактыўных рухавікоў. Дзярж. прэмія СССР 1946. Ленінская прэмія 1957.

Тв.: Газотурбинные установки. М., 1956; Теория реактивных двигателей. Лопаточные машины. М., 1956.

Літ.: Чуев Ф.И. Стечкин. 2 изд. М., 1979.

СЦЕ́ШЫЦ Валянцін Кірылавіч (10.1.1928, в. Доўгае Салігорскага р-на Мінскай вобл. — 5.10.1997), бел. вучоны ў галіне суд.-мед. экспертызы. Д-р мед. н. (1975), праф. (1978). Скончыў Мінскі мед. ін-т (1951). З 1959 у Цярнопальскім мед. ін-це (заг. кафедры). З 1961 у Мінскім мед. ін-це (заг. кафедры), у 1961—77 адначасова гал. суд.-мед. эксперт Мін-ва аховы здароўя. З 1976 у Вышэйшай школе МУС Беларусі. З 1993 у НДІ крыміналістыкі, крыміналогіі і суд. экспертыз, адначасова ў БДУ. Навук. працы па праблемах аўтатрансп. траўмаў, прафілактыцы дзіцячага траўматызму і інш.

Тв.: Судебно-медицинская экспертиза при дорожно-транспортных происшествиях. Мн., 1976.

СЦЕ́ШЫЦЫ, вёска ў Жарскім с/с Вілейскага р-на Мінскай вобл., каля р. Вілія. Цэнтр калгаса. За 40 км на ПнУ ад г. Вілейка, 120 км ад Мінска, 27 км ад чыг. ст. Княгінін. 359 ж., 134 двары (2002). Базавая школа, Дом культуры, б-ка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Касцёл Праабражэння Гасподняга. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

СЦЁК у гідралогіі, працэс сцякання дажджавых і расталых вод у вадаёмы і паніжэнні рэльефу на зямной паверхні і ў тоўшчы зямной кары; частка *кругавароту вады* ў прыродзе. Адрозніваюць С. паверхневы (схілавы, рэчышчавы) і падземны (з *грунтавых вод, глебавых вод* і *напорных вод*; гл. *Падземныя воды*). Большасць вады падземнага С. пераходзіць у паверхневы (рэчышчавы), калі ваданосны гарызонт ускрываецца ракой ці выходзіць у крыніцах. У асобных выпадках у перыяд веснавога разводдзя, ва ўмовах карсту ці пры ўзроўні падземных вод ніжэй за ўзровень вады ў рацэ ч. паверхневага С. пераходзіць у падземны. Велічыня і рэжым С. залежаць ад воднага балансу вадазбору (ападкаў, выпарэння), характару рэльефу і геал. будовы, глебавага і расл. покрыва. С. уплывае на фарміраванне рэльефу, геахім. працэсы ў зямной кары, развіццё глебавага покрыва, размеркаванне расліннасці і інш.; вызначае *эрозію*, прыродны дрэнаж і арашэнне, перанос і адкладанне прадуктаў дэнудацыі. У працэсе С. вада насычаецца рознымі біягеннымі рэчывамі, адбываецца С. наносаў, растворных і біягенных рэчываў, якія вызначаюць якасць вады.

Характэрная асаблівасць С. — яго зменлівасць у прасторы і часе. Ва ўнутрыгадавым ходзе С. вылучаюць *разводдзе, паводкі, межань* (летнюю і зімовую). Адносна раўнамерны на працягу года С. наз. зарэгуляваным. Пры ацэнцы водных рэсурсаў пэўнай тэрыторыі вылучаюць мясц. С., які фарміруецца ў межах аднароднага фіз.-геагр. раёна, і транзітны, які паступае ў раён з інш. тэрыторый. Велічыню С. характарызуюць аб'ёмам вады за адзінку часу (м^3/с, км^3/год), таўшчынёй слоя вады, раўнамерна размеркаванага па плошчы (мм), модулем сцёку (л/с·км^2), каэфіцыентам (у долях адзінкі). Вынікі даследавання фарміравання С. і яго характарыстык выкарыстоўваюцца пры гідралагічных разліках і складанні *гідралагічных прагнозаў*. С. падлічваецца на аснове назіранняў *гідралагічных пастоў*. Сумарны гадавы С. рэк Зямлі ў акіян складае 42·10 км^3. На Беларусі сярэдняя велічыня рачнога С. 57,9 км^3/год, у т.л. ў межах рэспублікі (мясц. С.) 34 км^3/год.

СЦЁКАВЫЯ ВО́ДЫ, вадкія адходы, якія ўтвараюцца ў выніку антрапагеннай дзейнасці; адна з асн. крыніц *забруджвання вод*. Падзяляюцца на камунальныя (гаспадарча-бытавыя), вытворчыя (прамысл. прадпрыемстваў, у т.л. па перапрацоўцы с.-г. прадукцыі), жывёлагадоўчыя (сцёкі жывёлагадоўчых комплексаў і ферм), ліўневыя (дажджавыя і ад раставання снегу з забудаваных тэрыторый або палівання вуліц і зялёных насаджэнняў), мяшаныя (камунальныя, вытв. і інш. сцёкі, якія паступаюць у агульную сістэму каналізацыі). Ствараюць пагрозу для здароўя чалавека і навакольнага прыроднага асяроддзя. Ачыстка С.в. адбываецца на *ачышчальных збудаваннях* (штучны спосаб) і цераз глебу і ваду на палях фільтрацыі і арашэння, біял. сажалках (натуральны спосаб). Нарматыўна-ачышчаныя С.в., якія адпавядаюць нормам якасці, могуць паўторна выкарыстоўвацца для водазабеспячэння. На Беларусі аб'ём С.в. у 1996—2000 складаў каля 1,2 км^3/год, у т.л. нарматыўнаачышчаных 0,9 км^3/год. *А.А.Макарэвіч.*

СЦЁКУ МО́ДУЛЬ, аб'ём *сцёку* за адзінку часу з адзінкі плошчы вадазбо-

ру. Вылічваецца шляхам дзялення расходу вады на плошчу вадазбору; звычайна выражаецца ў л/с·км^2 або м^3/с·км^2. Характарыстыкі С.м. выкарыстоўваюцца пры складанні карт сцёку.



Б.С.**Сцечкін**.



В.С.**Сцёпін**.

СЦЁПІН Вячаслаў Сямёнавіч (н. 19.8.1934, г.п. Наўля Бранскай вобл., Расія), бел. і рас. філосаф і культуролаг. Акад. Рас. АН (1994, чл.-кар. АН СССР з 1987). Д-р філас. н. (1975), праф. (1979). Скончыў БДУ (1956). З 1959 у Бел. політэхн. ін-це. З 1974 у БДУ (у 1981—87 заг. кафедры). З 1987 дырэктар Ін-та прыродазнаўства і тэхнікі АН СССР, з 1988 — Ін-та філасофіі Рас. АН. Навук. працы па праблемах метадалогіі навукі і тэорыі пазнання. Даследуе функцыі светапоглядных універсалій культуры і іх ролю ў трансляцыі гіст. вопыту, суадносіны універсалій культуры і філас. катэгорый. Апісаў раней не вывучаную аперацыю пабудовы тэорыі, што дазволіла вырашыць праблему фарміравання парадыгмальных узораў рашэння задач у складзе тэорыі. Раскрыў структуру асноў навукі (навук. карціна свету, ідэалы і нормы даследавання, філас. асновы) і выявіў іх узаемасувязь з тэорыямі і вопытам, іх функцыі ў навук. пошуку.

Распрацаваў канцэпцыі структуры і генезісу навук. тэорыі, тыпаў цывілізацыйнага развіцця і навук. рацыянальнасці, прааналізаваў механізмы ўздзеяння сацыякультурных фактараў на фарміраванне стратэгіі навук. даследавання.

Тв.: Современный позитивизм и частные науки. Мн., 1963; Методы научного познания. Мн., 1974 (разам з А.М.Елсуковым); Становление научной теории. Мн., 1976; Природа научного познания. Мн., 1979 (у сааўт.); Введение в философию. Ч. 1—2. М., 1989 (у сааўт.); Научная картина мира в культуре техногенной цивилизации. М., 1994 (разам з Л.Ф.Кузняцовай); Эпоха перемен и сценарии будущего: Избр. социал.-филос. публицистика. М., 1996; Философия, наука, цивилизация. М., 1999 (у сааўт.); Теоретическое знание: Структура, ист. эволюция. М., 2000.

СЦЁРТЭВАНТ, Стэртэвант (Sturtevant) Альфрэд Генры (21.11.1891, г. Джэксанвіл, штат Ілінойс, ЗША — 6.4.1970), амерыканскі вучоны ў галіне генетыкі, адзін з заснавальнікаў храмасомнай тэорыі спадчыннасці. Чл. Нац. АН ЗША. Скончыў Калумбійскі ун-т. З 1911 у лабараторыі Т.Х.*Моргана*. У 1928—62 праф. Каліфарнійскага тэхнал. ін-та. Навук. працы па сістэматыцы і параўнальнай цытагенетыцы відаў роду дразафіла. Абгрунтаваў тэорыю лінейнага размяшчэння генаў, адкрыў супрэсію (1920) і эфект становішча гена (1925).



СЦІ́КЛЕВА, біялагічны заказнік рэсп. значэння ў Мінскім р-не. Засн. ў 2001 для аховы ў натуральным стане ўчасткаў каштоўных лясных фармацый з папуляцыямі рэдкіх і знікаючых відаў раслін і жывёл. Пл. 412 га. Рэльеф дэнудацыйнага тыпу ў межах Мінскага канцова-марэннага ўзвышша акругі Бел. грады. Глебы дзярнова-падзолістыя флювіягляцыяльнага паходжання, пясчаныя і супясчаныя на лёгкіх лёсападобных суглінках. Расліннасць пераважна лясная хваёвая. У флоры 370 відаў сасудзістых раслін, з іх у Чырв. кнізе: купальнік горны, пярэсна еўрапейская, лілея паўночная, лілея кучаравая. Шмат лек., харч., кармавых, меданосных, дэкар. раслін. У фауне 7 відаў амфібій і рэптылій, 70 — птушак (у Чырв. кнізе пустальга звычайная), 13 — млекакормячых. *П.І.Лабанок.*

СЦІ́РТА, маса саломы ці сена, шчыльна складзеная для захоўвання пад адкрытым небам. У С. складаюць добра высушаную сыравіну з вільготнасцю не больш за 15—17%. Закладваюць С. паблізу месцаў зімовак с.-г. жывёлы, на пляцоўках з цвёрдым пакрыццём, вакол пракопваюць канаўкі для вадасцёку.

СЦІСКА́ЛЬНАСЦЬ, аб'ёмная пругкасць, здольнасць рэчыва зменьваць свой аб'ём. Адозніваюць С. ізатэрмічную, якая адбываецца пад дзеяннем ціску пры пастаяннай т-ры, і адыябатычную, калі адначасова са сціскannем рэчыва адбываецца яго награванне.

Характарызуецца каэф. С., які паказвае змяншэнне адзінкавага аб'ёму цела пры павелічэнні ціску на адну адзінку. Адваротнай велічынёй каэф. С. з'яўляецца модуль аб'ёмнага сціскання (гл. *Модулі пругкасці*). Калі рэчыва пры сціскanні не набывае хім., структурных і інш. змен, то пры знятці ціску яго аб'ём аднаўляецца. С. газаў (пары), вадкасцей і цвёрдых цел улічваецца пры канструяванні цеплавых машын, разліку працэсаў і апаратаў хім. прам-сці, лятальных апаратаў і канструкцый, праходцы свідравін і інш. *І.І.Леановіч.*

СЦІСКА́ННЕ, гл. *Расцяжэнне-сціскanне.*

СЦІСКА́ННЕ ДА́НЫХ, пераўтварэнне даных у больш кампактную форму без страты карыснай інфармацыі. Праводзіцца з мэтай змяншэння лішкавасці, эканоміі памяці, а таксама павышэння эфектыўнасці выкарыстання сродкаў перадачы і захоўвання інфармацыі.

Існуюць метады *кадзіравання* інфармацыі для змяншэння лішкавасці даных, іх ушчыльнення і дасягнення найб. магчымай ступені С.д. пры абмежаваным аб'ёме памяці і прымальнай хуткасці перадачы, напр., у *Інтэрнеце*. Аналагічныя метады выкарыстоўваюцца пры рэгістрацыі інфармацыі, стварэнні архіваў на розных носьбітах інфармацыі, рэзервовых копій важных даных і інш. Найб. разнастайныя метады выкарыстоўваюцца пры перадачы і захоўванні відарысаў (графічнай інфармацыі, здымкаў, схем і інш.). У статычным рэжыме С.д. выконваецца з дапамогай праграм-архіватараў. Можа быць С.д.

са стратамі — частка неістотнай інфармацыі адкідваецца для забеспячэння найб. ступені сціскання. Пры С.д. з дапамогай праграм-архіватараў група алфавітных, лічбавых ці інш. сімвалаў замяняецца на інш. групу сімвалаў з захаваннем сэнсу зыходных даных, напр., аб'ём літарнага тэксту змяншаецца ў 2—5 разоў. Існуюць таксама розныя тыпы дынамічнага С.д. (у рэальным часе), якое забяспечвае апаратыўны доступ да даных. Напр., для растравых відарысаў эфектыўнае фрактальнае (гл. *Фрактал*) С.д., якое патрабуе для захавання відарысаў прыкладна ў 4 разы меншы аб'ём памяці ў параўнанні з захаваннем яго ў выглядзе пікселаў.

Літ.: Борзенко А. Методы сжатия данных // Компьютер Пресс. 1995. №8.

С.У.Абламейка, М.П.Савік.

СЦІСНУТАБРУ́ХІ (Sympetrum), род сям. сапраўдных стракоз. Каля 150 відаў. Пашыраны ўсюды (за выключэннем засушлівых і арктычных абласцей) паблізу вадаёмаў. Лічынкі жывуць у стаячых або павольнацякучых водах. На Беларусі 5 відаў; С. перавязаны (S. pedemontanum) занесены ў Чырв. кнігу.

Даўж. брушка 18—28 мм, задніх крылаў 21—29 мм. Афарбоўка разнастайная, акрамя блакітнай і зялёнай. Крылы з шырокай цёмнай перавяззю перад вяршыняй. Брушка ў самцоў чырв., у самак жоўтае. Лічынкі валасатыя або амаль голыя. Драпежнікі.

СЦЫЕНТЫ́ЗМ (ад лац. scientia веды, навука), светапоглядная пазіцыя, заснаваная на ўяўленні пра навук. веды як найвышэйшую каштоўнасць культуры і ўмову арыентацыі чалавека ў свеце. Характарызуецца абсалютызацыяй ролі вынікаў і метадаў прыродазнаўча-навук. пазнання. Аформіўся ў канцы 19 — пач. 20 ст. як антытрадыцыяналісцкая ідэалогія, накіраваная на *мадэрнізацыю* і інавацыі, што развівалі асн. прынцыпы еўрап. прагрэсізму і *рацыяналізму*. На ўзроўні масавай свядомасці выявіўся ва ўяўленнях пра навук. падыход як універсальную праграму паводзін людзей, прытрымліванне якой гарантуе паспяховасць ва ўсіх сферах дзейнасці. У галінах гуманіт. ведаў характарызуецца імкненнем развіваць гуманіт. дысцыпліны ў адпаведнасці з асн. прынцыпамі прыродазнаўчых навук. Філас. абгрунтаванне С. прапанавалі прадстаўнікі шэрагу кірункаў *неапазітывізму*, тэхнал. дэтэрмінізму; асобныя аспекты С. характэрны для філас. дактрыны марксізму. Супрацьлеглая С. светапоглядная пазіцыя (антысцыентызм) падкрэслівае абмежаванасць магчымасцей навукі і разглядае яе як прычыну ўзнікнення шматлікіх сац. і экалагічных праблем. Антысцыентысцкія пазіцыі характэрны для *экзістэнцыялізму, франкфурцкай школы*, для экалагічнага грамадскага руху, *фемінізму* і часткова *неакансерватызму*.

Літ.: Юдин Э.Г., Юдин Б.Г. Наука и мир человека. М., 1978; Методологические проблемы научного знания. Мн., 1983.

А.Б.Савеня.

СЦЫ́ЛА І ХАРЫ́БДА, Скіла і Харыбда, у старажытнагрэчаскай міфалогіі марскія пачвары, якія жылі каля вузкага праліва і падпільноўвалі мараходаў. Сцыла ўяўлялася пачварай з 6 сабачымі галовамі, трыма шэрагамі зубоў і дванаццаццю нагамі, Харыбда — у выглядзе страшэннага віру, што тройчы ў дзень усмоктваў і вывяргаў ваду. Праплыць паміж С. і Х. здолелі толькі *арганаўты* і *Адысей*.

А.Г.Зельскі.

СЦЫ́НКАВЫЯ, сцынкі (Scincidae), сямейства яшчарак інфраатр. сцынкападобных кл. паўзуноў. Больш за 90 родаў, каля 1200 відаў. Пашыраны ўсюды, акрамя Антарктыды, пераважна ў тропіках Усх. паўшар'я, асабліва ў межах Аўстралійскай біягеагр. вобл. Вядуць наземны, рыючы і паўдрэвавы лад жыцця, некат. віды паўводныя. З віды занесены ў Чырв. кнігу МСАП.

Даўж. да 65 см. Цела падоўжнае, да змееподобнага; укрыта гладкай або рабрыстай налягаючай луской, пад якой размешчаны касцявыя пласцінкі (астэадэрмы). Хвост ломкі. У рыючых форм канечнасці часткова або канчаткова страчаны, вочы звычайна адсутнічаюць. Кормяцца пераважна насякомымі, буйныя С. — і пазваночнымі; некат. расліннаедныя. Большасць відаў адкладваюць яйцы, ёсць яйцажыворадныя і жывародныя.

Э.Р.Самусенка.

СЦЫНТЫЛЯ́ТАР (ад лац. scincillatio мігаценне), *люмінафор*, у якім пад уздзеяннем іанізавальных выпрамяненняў узнікаюць светлавыя ўспышкі (*сцынтыляцыі*). Асн. патрабаванне — празрыстасць для ўласнага выпрамянення. С. могуць служыць многія крышталефасфоры (напр., сярністы цынк, ёдзісты натрый), арган. крышталі (напр., антрацэн, стыльбен), растворы пластмас, інертныя газы і інш. Выкарыстоўваюцца ў *сцынтыляцыйных лічыльніках*.

СЦЫНТЫЛЯЦЫ́ЙНЫ ЛІЧЫ́ЛЬНІК, адзін з *дэтэктараў ядзерных часціц*, асн. элементы якога — *сцынтылятар* і *фотаэлектронны памнажальнік* (ФЭП). Для змяншэння страт святла сцынтылятар прыклейваюць да катода ФЭП ці злучаюць з ім з дапамогай святлаводаў.

Зараджаная часціца, што праходзіць праз сцынтылятар, разам з іанізацыяй узбуджае атамы і малекулы рэчыва, якія пры вяртанні ў асн. стан выпрамяняюць *фатоны*. Фатоны выбіваюць электроны з катода ФЭП, у выніку чаго ўзнікае імпульс току, які ўзмацняецца і рэгіструецца лічыльнікам. Нейтральныя часціцы (нейтроны, гама-кванты і інш.) рэгіс-



Сціснутабрухі: 1 — звычайны; 2 — перавязаны; 3 — жаўтаваты; 4 — чорны (а — самец; б — самка).



Сцынкавыя: 1 — сцынк далёкаўсходні; 2 — галавочка еўрапейская; 3 — сцынк пясчаны; 4 — сцынк шчытковы; 5 — сцынк калючы.

труюцца за кошт другасных зараджаных часціц, якія ўтвараюцца пры іх узаемадзеянні з атамамі сцынтылятара.

СЦЫНТЫЛЯ́ЦЫЯ, кароткачасовыя ўспышкі *люмінесцэнцыі*, што ўзнікаюць у *сцынтылятарах* пад уздзеяннем іанізавальных выпрамяненняў. С. ўпершыню назіраў У.*Крукс* (1903) пры абпрамяненні альфа-часціцамі экрана з сярністага цынку.

Кожная С. — вынік уздзеяння адной часціцы, што выкарыстоўваецца ў *сцынтыляцыйных лічыльніках* для рэгістрацыі элементарных часціц. Атамы (ці малекулы) сцынтылятара за кошт энергіі зараджаных часціц пераходзяць ва ўзбуджаны стан, пры пераходзе з якога ў нармальны стан выпрамяняецца святло. Механізм С., яе спектр выпрамянення і працягласць залежаць ад рэчыва сцынтылятара, яркасць успышкі — ад энергіі, перададзенай зараджанымі часціцамі часціцам сцынтылятара.

СЦЫПІЁН АФРЫКА́НСКІ Малодшы, Публій Карнелій Сцыпіён Эміліян Афрыканскі Малодшы (Publius Cornelius Scipio Aemilianus Africanus Junior; каля 185—129 да н.э.), старажытнарымскі палкаводзец і паліт. дзеяч. Прыёмны ўнук *Сцыпіёна Афрыканскага* Старэйшага. У 151 да н.э. ваяваў у Іспаніі. Абраны консулам, захапіў і разбурыў у 146 да н.э. *Карфаген*. У 142 да н.э. цэнзар, у 133 да н.э. завяваў *Нуманцыю*. Выступаў супраць рэформ *Гракхаў*. Захапляўся грэч. культурай. Аб'яднаўшы ў т.зв. «Сцыпіёнаў гурток» грэч. пісьменнікаў (*Палібій* і інш.), імкнуўся перанесці ў рым. культуру эліністычнае мастацтва і адукацыю.

А.Г.Зельскі.

СЦЫПІЁН АФРЫКА́НСКІ Старэйшы, Публій Карнелій Сцыпіён Афрыканскі Старэйшы (Publius Cornelius Scipio Africanus Major; каля 235 — каля 183 да н.э.), старажытнарымскі палкаводзец і паліт. дзеяч. Як ваен. трыбун удзельнічаў у бітве пры *Канах* (216 да н.э.). У 207 да н.э. разбіў войска карфагенскага палкаводца Гасдрубала. Консул 205 да н.э. Перамог армію *Ганібала* пры Заме (202 да н.э.). З 199 да н.э. цэнзар і прынцэпс сената, консул 194 да н.э. Увёў новую тактыку ў рым. арміі, удасканальваў зброю. Яго неабмежаваны ўплыў на армію і знешнюю палітыку выклікаў незадаволенасць сенатараў. Зняважаны т.зв. «працэсам Сцыпіёнаў», пакінуў справы, жыў у сваім маёнтку. Шырокаадукаваны чалавек, сімпатызаваў грэч. культуры.

А.Г.Зельскі.

СЦЫПІЁНЫ (Scipiones), у Старажытным Рыме адна з галін патрыцыянскага роду Карнеліяў. Адыгралі вял. ролю ў паліт. і грамадскім жыцці Стараж. Рыма, садзейнічалі ўмацаванню яго гегемоніі ў Міжземнамор'і. З іх найб. вядомыя: Луцый Карнелій С. Барадаты, паліт. дзеяч 3 ст. да н.э., консул 298 да н.э. Перамог *самнітаў* у Самніі, Луканіі і Этрурыі. Публій Карнелій С. (гл. *Сцыпіён Афрыканскі* Старэйшы). Яго брат Луцый Карнелій С. Азіяцкі, паліт. дзеяч канца 3 — пач. 2 ст. да н.э. Легат у Іспаніі 207—206 да н.э., Сіцыліі 205 да н.э., Афрыцы 204 да н.э. Консул 190 да н.э. Публій Карнелій С. Назіка Серапіён (?—132 да н.э.), консул 138 да н.э., узначальваў сенатараў, якія ў 133 да н.э. забілі Тыберыя Гракха (гл. *Гракхі*). Публій Карнелій С. Эміліян (гл. *Сцыпіён Афрыканскі* Малодшы). Карнелія, дачка С. Афрыканскага Старэйшага, маці Тыберыя і Гая Гракхаў. Яе дачка Семпронія стала жонкаю С. Афрыканскага Малодшага. Пасля смерці Гракхаў жыла ў Мізене (каля Неапаля), карысталася вял. павагай. Яе лічылі ўзорнай рымлянкай.

Літ.: Трухина Н.Н. Политика и политики «золотого века» Римской республики (II в. до н.э.). М., 1986. *А.Г.Зельскі.*

СЦЫПІЁНЫ, Сцыпіё дэль Кампа, шляхецкі род уласнага герба ў ВКЛ. Вялі радаслоўную ад неапалітанца Пятра Сцыпіёна дэль Кампы, дваранiна каралевы *Боны Сфорцы*. Найб. вядомыя:

Казімір (?—1733), сын Андрэя, адміністратар Шавельскай эканоміі ў 1705—18, лідскі мечнік з 1701, пісар гродскі з 1711, падстолі з 1713, падкаморы з 1714, маршалак з 1716 або 1717.

Ян (?—1738), брат Казіміра, лідскі пісар гродскі ў 1695—1708, падстолі з 1704, староста ў 1713—20, кашталян смаленскі з 1720. У 1735 заснаваў у Воранаве піярскі калегіум.

Юзаф (? — да 9.6.1743), сын Яна, староста лідскі з 1720, маршалак надворны ВКЛ з 1739.

Ігнацы (пасля 1728—91), сын Юзафа, староста лідскі з 1743, падстолі ВКЛ у 1765—86, ген.-маёр (1759), чл. Пастаяннай Рады з 1776. Перавёў піярскі калегіум з Воранава ў Ліду (1756, гл. *Лідскі піярскі калегіум*).

СЦЫФО́ІДНЫЯ (Scyphozoa), клас жывёл тыпу кішачнаполасцевых. Вядомы з ніжняга кембрыю. 5 атр.: дыскамедузы, каранаты, караняротыя медузы, кубамедузы, стаўрамедузы. Каля 200 відаў. Пашыраны ва ўсіх морах, пераважна ў трапічных. Найб. вядомыя аўрэлія, або вушастая медуза (Aurelia aurita), каранярот, або рызастома (Rhizostoma pulmo), ядомая рапілема (Rhopilema esculenta) і інш.

Памеры ад 1—3 мм (*паліпы*) да 2,3 м (*медузы*). Жыццёвы цыкл з чаргаваннем пакаленняў. Палавое пакаленне — медузы (сцыфамедузы). Лічынкі медуз (планулы) асядаюць на субстрат і ператвараюцца ў паліпы (сцыфастомы) — бясполае пакаленне. Папярочным дзяленнем паліп утварае маладых медуз. *Жыгучыя клеткі* некат. С. выклікаюць моцныя апёкі. Ёсць ядомыя. Ll. гл. таксама да арт. *Медузы*.

СЦЬЮ́АРТ (Stewart), востраў у Ціхім ак., каля паўд. краю Паўднёвага в-ва Новай Зеландыі, тэр. Новай Зеландыі. Аддзелены ад Паўд. в-ва пралівам Фова. Пл. 1742 км^2. Нас. каля 500 тыс. чал. (2000). Выш. да 980 м (г. Англем). Складзены з метамарфічных парод і гранітаў. Клімат умераны марскі. Шыракалістыя і хвойныя лясы, балоты. Рыбалоўства. Нас. пункт — Обан. Летні курорт.

СЦЭ́ВАЛА Гай Муцый (Gaius Mucius Scaevola, літаральна ляўша), у Стараж. Рыме легендарны герой часоў барацьбы рымлян супраць *этрускаў* (канец 6 — пач. 5 ст. да н.э.). Паводле падання, юнак Гай Муцый павінен быў прабрацца ў лагер этрускаў і забіць цара Парсену, але быў схоплены. Парсена патрабаваў назваць імёны саўдзельнікаў, пагражаючы юнаку жорсткімі катаваннямі. Жадаючы паказаць, як ён мала баіцца болю і смерці, Муцый сам апусціў правую руку ў агонь і не выдаў ніводнага гуку, пакуль тлела рука. Магчыма, гэта паданне ўзнікла як тлумачэнне прозвішча Сцэвала (Ляўша), замацаванага за галіною роду Муцыяў.



Да арт. **Сцыфоідныя**. Медузы: 1 — антарктычная; 2 — васьмірук; 3 — цыянея.

СЦЭ́НА (лац. scaena ад грэч. skēnē палатка, шацёр, тэатр. падмосткі), 1) месца тэатр. дзеяння; адна з асн. частак тэатр. будынка. Сучасны тып С. склаўся ў выніку эвалюцыі, абумоўленай развіццём тэатр. мастацтва і прынцыпаў дэкарацыйнага афармлення спектакля.

Еўрап. С. ўзнікла як архестра стараж.-грэч. т-ра (круглая пляцоўка для выступлення акцёраў і хору). У эпоху эліншму месцам выступлення служыў праскеній, у стараж.-рым-

скім т-ры — прасцэніум. У сярэднія вякі паявіліся С. з сімультанным прынцыпам дэкарацыі — адначасова ставіліся ўсе дэкарацыі, неабходныя па ходу дзеяння. У 17 ст. ў Англіі склаўся тып т.зв. шэкспіраўскай С.: памост, падняты на вышыню чалавечага росту і падзелены дзвюма калонамі на гал. і сярэднюю С., за якімі была ўнутр. С., над ёй — верхняя. У пач. 16 ст. ў Італіі з'явіўся новы тып С., якая мела глыбінны планшэт з перспектыўнымі дэкарацыямі. Далейшая эвалюцыя ішла па шляху ўдасканалення С.-каробкі: кулісная сістэма абсталявання, кулісныя машыны, павільённыя дэкарацыі, гідраўлічныя пад'ёмнікі, паваротны круг, плунжэры (механізаваныя пад'ёмныя часткі планаў С.) у спалучэнні з накатнымі пляцоўкамі (фуркамі).

Класічны тып сучаснай С. — замкнёная каробка, злучаная з глядзельнай залай партальнай адтулінай, т.зв. люстэркам С. Сцэн. каробка падзяляецца на 3 часткі: ніжнюю — 1—2 і больш паверхаў падсцэнных памяшканняў-трумаў; сярэднюю, на якой адбываецца тэатр. дзеянне; верхнюю, абмежаваную столлю-каласніком. Вышэй знаходзіцца каласніковая прастора, па баках — кішэні — памяшканні для манціроўкі складаных аб'ёмных дэкарацый. Па бакавых частках верхняй С. размяшчаюцца вузкія, у некалькі ярусаў рабочыя галерэі з механізмамі і інш.

На Беларусі класічны тып С. склаўся ў 17—18 ст. у школьным т-ры. У 2-й пал. 18 ст. адна з самых вялікіх і добра абсталяваных С. была ў Слуцкім т-ры Радзівіла, Слонімскім т-ры Агінскага. Развітую сцэн. частку класічнага тыпу маюць сучасныя будынкі т-раў імя Я.Купалы, Я.Коласа, М.Горкага, Бел. дзярж. муз. т-ра, абл. драм. т-раў у Магілёве, Гомелі, Гродне і інш.

2) Асобная частка дзеі, акта, п'есы, спектакля. 3) У шырокім сэнсе — тое, што *тэатр*.

Літ.: Бархин Г.Б. Архитектура театра. М., 1947; Извеков Н.П. Сцена. Т. 1—2. М.; Л., 1935—40. *А.А.Лабовіч.*

СЦЭНАГРА́ФІЯ (ад *сцэна* + *...графія*), тэатральна-дэкарацыйнае мастацтва, сукупнасць прасторава вырашэння спектакля, што вызначае візуальную значнасць тэатр. вобраза (*дэкарацыі, касцюм* тэатральны, *грым, рэквізіт*, асвятленне, пастановачная тэхніка, архітэктурная зададзенасць т-ра, пластычныя магчымасці акцёрскага складу і інш.); адзін з вызначальных і арганічных кампанентаў у арганізацыі маст. цэласнасці спектакля побач з сюжэтна-драм. і гукава-муз. строямі. Сінкрэтычны від мастацтва, які спалучае выяўл. і тэатр. мастацтва. Развіццё С. адбывалася ў рэчышчы гісторыі т-ра і пануючых маст. стыляў.

Элементы С. прысутнічалі ў стараж. абрадах і гульнях (маскі, касцюмы, рэквізіт). З 5 ст. да н.э. ў ант. т-ры вядомы аб'ёмныя дэкарацыі, якія ў эпоху элінізму сумяшчаліся з жывапіснымі. З сярэдневякоўя пачаўся пераход ад гульнявой С. плошчавых прадстаўленняў да сістэмы дэкарац. мастацтва, дзе дамінавалі функцыі выяўлення, сачынення месца дзеяння. У эпоху Адраджэння ўзнік тып архітэктурна-перспектыўнай дэкарацыі з адзіным нязменным месцам дзеяння (Д.Брамантэ, Б.Перуцы, С.Серліо). Пазней рэльефныя дэкарацыі замяняліся жывапіснымі ў стылі барока. У канцы 16—17 ст. феерычны характар прыдворнага оперна-балетнага спектакля абумовіў выкарыстанне тэатр. механізмаў (Б.Буанталенці, Н.Сабаціні ў Італіі, І.Фуртэнбах у Германіі), стварэнне сістэмы куліс (Дж. Алеоці ў Італіі) і сцэны-каробкі (гл. *Сцэна*). У эпоху класіцызму драматургічны канон адзінства месца і часу сцвердзіў пастаянную і нязменную строгую дэкарацыю. Развіццё оперная мастацтва абумовіла адмаўленне ад сіметрыі, увядзенне вуглавой перспектывы, узмацненне ілюзіі глыбіні кантрастаў святла і ценю і інш. (А.Поца, сям'я Галі-Бібіена, Дж.Валерыяні, П.Ганзага, Італія). У канцы 18 ст. ў Францыі пашырыліся т.зв. працікаблі (аб'ёмныя дэкарацыі — масты, скалы), якія перадавалі складаныя эфекты. Прынцыпы рамантызму з патрабаваннем нац. і гіст. характарыстыкі месца дзеяння (шматкарцінныя дэкарацыі, касцюмы) увасаблялі рэжысёры і дэкаратары П.Сісеры, Ш.Сешан, Э.Дэлакруа, П.Дэларош (Францыя), Ф. фон Дзінгельштэт (Германія), Ч.Кін (Англія), А.Ролер (Расія) і інш. У канцы 19 ст. С. класіцызму і рамантызму супрацьстаялі плыні натуралізму (дакладная перадача сац. асяроддзя — рэж. А.Антуан, О.Брам) і сімвалізму (умоўна-спрошчаныя, стылізаваныя дэкарацыі — М.Дэні, П.Серузье, А.Тулуз Латрэк, Францыя; Э.Мунк, Нарвегія, і інш.). З 1870-х г. ў Расіі да працы ў т-ры прыцягваліся жывапісцы В.Васняцоў, К.Каровін, В.Паленаў, В.Сяроў, М.Урубель, якія сцвярджалі прынцып цэласнай трактоўкі спектакля. На мяжы 19—20 ст. даследаваліся прырода і спецыфіка законаў сцэн. мастацтва, паступова змяніўся прадмет выяўлення ў С., увага скіроўвалася на сутнасныя, нематэрыяльныя паняцці. Новыя прынцыпы афармлення, якія сімвалічна выражалі сэнс драмы, сцвердзілі рэжысёры А.Апія (Швейцарыя), Г.Крэг (Англія) — ідэя «філас.



Да арт. **Сцэнаграфія**. А.Марыкс. Эскіз дэкарацыі да спектакля «Кастусь Каліноўскі» Е.Міровіча. 1923.

т-ра» з дапамогай пазачасавай дэкарацыі (кубы, пляцоўкі, лесвіцы і інш.); Г.Фукс (Германія) — праект «рэльефнай сцэны», якая страчвае глыбіню; М.Райнгарт (Германія) — прыёмы ад жывапісна-аб'ёмнай дэкарацыі да абагульнена-ўмоўных нерухомых установак. На развіццё С. ў Расіі паўплывала рэаліст. рэформа Маскоўскага Маст. т-ра (МХТ): індывід. афармленне кожнай пастаноўкі, псіхалагізм (В.Сімаў). Пошукі абнаўлення прыёмаў С. вёў К.Станіслаўскі ў супрацоўніцтве з мастакамі аб'яднання «*Свет мастацтва*». Створаныя імі ж дэкарацыі ў «Рускіх сезонах» С.Дзягілева ў Парыжы вызначаліся багаццем жывапісу, фантазіяй, густам. У пач. 20 ст. ўмоўную сцэн. прастору распрацоўваў У.Меерхольд з мастакамі А.Галавіным, М.Сапуновым, С.Судзейкіным. З 1910-х г. у С. праявіліся рысы авангардызму, выкарыстанне прыёмаў кубізму, футурызму, прымітывізму (А.Вяснін, К.Малевіч, У.Татлін, П.Філонаў, І.Школьнік, Расія; Дж.Северыні, Ф.Дэперо, Італія; Ф.Лежэ, П.Пікасо, Францыя), у 1920-я г. — экспрэсіянізму (Ж.Грос, Германія). Развіццё С. 1920-х г. у СССР вызначалася шматпланавасцю выразных маст. сродкаў, барацьбой розных стылістычных кірункаў: рэаліст. жывапісная традыцыя дэкарацыйнага мастацтва (М.Крымаў, Б.Кустодзіеў, Сімаў, Ф.Федароўскі), канструктывізм Меерхольда (Л Папова, В.Сцяпанава), экспрэсіяністычныя тэндэнцыі дэкарацый (Н.Альтман, М.Левін, І.Нівінскі, І.Рабіновіч, Р.Фальк, М.Шагал і інш.). С. 1930—50-х г. вызначылі мастакі М.Акімаў, Альтман, А.Басулаеў, М.Бобышаў, П.Вільямс, Б.Волкаў, У.Дзмітрыеў, Б.Кноблак, А.Рыкаў, В.Рындзін, А.Тышлер, Ф.Федароўскі, Н.Шыфрын і інш. У 1960—70-я г. С. дасягнула росквіту ў сусв. т-ры. Вызначыліся асн. яе кірункі — ад авангарду, абагульненай формулы чыстай пустой прасторы (Х.Эйхенбаўэр, Бразілія) да дзейснай С., якая характарызавалася імкненнем мастакоў раскрыць сутнасць дзе-



План класічнай **сцэны**-каробкі.

яння праз глабальныя праблемы чалавечага жыцця, абагульнена-метафарычнае асяроддзе: Дз.Бароўскі, С.Вірсаладзе, Э.Качаргін, М.Кітаеў, В.Левенталь, Д.Лідэр, А.Фрэйберг і інш. (СССР); Дж.Бары, Р.Колтаі, Т.О'Брайн (Вялікабрытанія) з дызайнерскім падыходам да афармлення спектакля; І.Свобада (Чэхія) з цыклам архітэктурна-кінетычных, светлавых, праекцыйных і лазерных вырашэнняў спектакляў. У 1980—90-я г. С. ўласцівы стылістычны плюралізм, раўназначнае суіснаванне розных прынцыпаў і прыёмаў афармлення сцэн. дзеяння.

На Беларусі элементы С. былі ўжо ў рытуальным адзенні і атрыбутах удзельнікаў нар. абрадаў, русалляў, Купалля і Каляд, прадстаўленнях скамарохаў і вандроўных батлейкавых артыстаў. Пашырэнне ведаў пра С. звязана з дзейнасцю Ф.Скарыны, Сімяона Полацкага, С.Будны, Л.Зізанія, І.Фёдарава, С.Полацкага, І.Капіевіча, І.Капіевіча-Капіевіча, І.Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча, І.Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча, І.Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча, І.Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча, І.Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча, І.Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча, І.Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча, І.Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча, І.Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча, І.Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча, І.Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча, І.Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча, І.Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча, І.Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча, І.Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча, І.Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча, І.Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча, І.Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча, І.Капіевіча-Капіевіча, І.Капіевіча-Капіевіча, І.Капіевіча-Капіевіча, І.Капіевіча-Капіевіча, І.Капіевіча-Капіевіча, І.Капіевіча-Капіевіча, І.Капіевіча-Капіевіча, І.Капіевіча-Капіевіча, І.Капіевіча-Капіевіча, І.Капіевіча-Капіевіча, І.Капіевіча-Капіевіча, І.Капіевіча-Капіевіча, І.Капіевіча-Капіевіча, І.Капіевіча-Капіевіча, І.Капіевіча-Капіевіча, І.Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-Капіевіча-

афармлення спектакляў узбагачаюцца сродкі выразнасці сцэн. прасторы. Выкарыстанне новых відаў прасторавых канструкцый, маст. метафары, каляровага асвятлення ўласціва С. М.Апіёка, М.Волахава, В.Галубовіча, Л.Ганчаровай, Э.Гейдэбрэхта, Б.Герлавана, Грыгар'янца, Я.Ждана, Т.Карвяковай, А.Кляўзера, В.Лесіна, Я.Лысіка, З.Марголіна, У.Матросава, Дз.Мохава, Л.Рулёвай, А.Салаўёва, Ю.Тура, В.Цімафеева, Я.Чамадурава, У.Чарнышова, М.Якуніна і інш. ў драм. і муз. т-рах. Развіваецца С. лялечнага т-ра (мастакі Л.Быкаў, А.Вахрамееў, Л.Герлаван, У.Зайцава, А. і Г. Сідаравы, Л.Сідзельнікава, В.Рачкоўскі, А.Фаміна і інш.).

Літ.: Тэатральна-дэкарацыйнае мастацтва Савецкай Беларусі. Мн., 1958; Карнач П.А. Дэкарацыйнае мастацтва музычнага тэатра БССР. Мн., 1973; Яго ж. Тэатральна-дэкарацыйнае мастацтва // Гісторыя беларускага мастацтва. Мн., 1989—94. Т. 3—6; Сыркина Ф.Я., Костина Е.М. Русское театрально-декорационное искусство. М., 1978; Михайлова А.А. Образ спектакля. М., 1978; Березкин В.И. Искусство оформления спектакля. М., 1986; Мастацтва беларускіх дэкаратараў. Мн., 1989.

Н.В.Грэская.

СЦЭНА́РЫЙ (італьян. scenario ад лац. scaena сцэна), 1) у тэатры імправізацыі — сюжэтная схема для стварэння спектакля. На падставе С. будаваліся прадстаўленні розных відаў нар. т-ра (грэч. мім, рым. атэлана, зах.-еўрап. фарс, італьян. камедыя дэль артэ, франц. кірмашовы т-р 17—18 ст.). Уяўляў кароткі выклад зместу п'есы, у аснове якой ляжалі традыц. сюжэтныя павароты і вобразы-маскі. У С. вызначаліся гал. моманты дзеі, выхады персанажаў, устаўныя нумары; дыялогі і маналогі акцёраў нараджаліся ў працэсе ігры. У драматычным тэатры 20 ст. — дэталізаваны план спектакля (рэжысёрская партытура); важны кампанент стварэння драм. спектакля. Робіцца з мэтай канкрэтызацыі відовішчных аспектаў дзеі драмы. 2) У музычным тэатры — драматургічны план *лібрэта*, а таксама яго дыялагічная частка. У балеце — пераказ сюжэта (лібрэта балетнае) з апісаннем танц. нумароў і мімічных сцэн, аснова для стварэння музыкі кампазітарам, а балетмайстрам — спектакля; блізкі па будове да С. ў т-ры імправізацыі, а таксама ў пантаміме. 3) У цырку і на эстрадзе — план прадстаўлення (канцэрта) з вызначэннем усіх яго частак, а таксама тэксты выступленняў канферансье, клоунаў, чытальнікаў. 4) У кінематографе, на тэлебачанні С. (кінасцэнарый) — літ. твор для экраннага ўвасаблення сродкамі кіна- і тэлемастацтва; ідэйна-маст. аснова фільма. Бываюць С. арыгінальныя і створаныя па матывах рамана, аповесці, апавядання, п'есы, нарыса, эсэ, паэмы, верша і інш. (гл. *Кінадраматургія, Экранізацыя*). Кампазіцыйная будова тэлесцэнарыя падпарадкоўваецца законам драматургіі і спецыфіцы тэлевізійнага мастацтва. У працэсе развіцця кінематографа С. з тэхнічнага дакумента ператварыўся ў спецыфічную літ. форму. Сучасны С. па прынцыпе будовы найчасцей блізкі да празаічнага твора, часам да драмы. Уяўляе сабой адзінства і яго кампанентаў: рэмаркі (апісальнай часткі), дыялога, аўтарскага тэксту (голас апавядальніка за кадрам) і цітраў. Кінафільмы ствараюцца паводле С. ўласна літаратурнага і рэжысёрскага (пастановачнага) — дэталёвага творчага плана стварэння фільма, які вызначае мантажнае рашэнне, спосабы здымак, планы, ракурсы, выяўл. і муз. рашэнне і інш. Існуе і прамежкавы этап распрацоўкі С. (пераклад літ. запісу ў творча-вытворчы). Тэорыю С. распрацоўвалі рэжысёры і кінадраматургі С.Эйзенштэйн, А.Даўжэнка, В.Туркін, Н.Зархі, С.Герасімаў і інш. Сярод аўтараў С. бел. фільмаў пісьменнікі і кінадраматургі М.Чарот, А.Вольны, Р.Кобец, В.Быкаў, І.Шамякін, У.Караткевіч, А.Адамовіч, А.Асіпенка, А.Вялюгін, К.Губарэвіч, А.Дудараў, В.Казько, Ф.Конеў, А.Петрашкевіч, У.Халіп і інш.

Літ.: Шкловский В. Как писать сценарии. М.; Л., 1931; Пудовкин В. Собр. соч. Т. 1. М., 1974; Ромм М. Беседы о кино. М., 1964.

А.М.Асташонак, Л.М.Зайцава.

СЦЭНІ́ЧНЫ ТА́НЕЦ, адзін з асноўных відаў танца, які прызначаны для выканання на сцэне (у адрозненне ад *бытавога танца*). Гал. прыкмета С.т. — наяўнасць маст. вобраза, які ствараецца ўдасканальваннем выразных магчымасцей быт. і нар. танцаў. У стварэнні С.т. важная роля належыць харэографу-пастаноўшчыку, які выразнымі сродкамі танца надае пластыцы сцэн. твора новыя эстэт. якасці.

С.т. бярэ пачатак у фальклорным мастацтве народаў свету. Яго ўзнікненне звязана са з'яўленнем прафес. мастацтва. Ужо ў антычнасці адбыўся яго падзел на ўласна танец і *пантаміму*. Сучасная сістэма С.т. з падзелам на *класічны танец* і *характарны танец*, пачала складвацца ў эпоху Адраджэння; яна развіваецца, удасканальваецца і ўбірае ў сябе элементы інш. пластычных і танц. сістэм (бальнага танца, драм. пантамімы, свабоднай пластыкі, сучаснай харэаграфічнай мовы). Асн. віды сучаснага С.т.: класічны, нар.-сцэнічны, *танец мадэрн*, джаз-танец і інш.

На Беларусі С.т. развіваўся ад пачатковых форм у творчасці скамарохаў. Больш дасканалых форм ён дасягнуў у балетных спектаклях прыгонных т-раў 18—19 ст., у паказах трупы І.Буйніцкага ў пач. 20 ст. У наш час пашыраны ў Нац. т-ры балета Беларусі, у дзейнасці прафес. і аматарскіх харэаграфічных калектываў розных маст. кірункаў.

С.В.Гуткоўская.

СЦЮА́РТ (Stuart) Гілберт (3.12.1755, г. Нарагансет, ЗША — 9.7.1828), амерыканскі жывапісец, адзін з заснавальнікаў амер. партрэтнай школы. Вучыўся ў К.Александэра (з 1769). У 1773—92 жыў і вучыўся ў Вялікабрытаніі і Ірландыі, з 1793 у ЗША, пераважна ў Бостане. Засвоіўшы віртуозную манеру Т.*Гейнсбара* і Дж.*Рэйнальдса*, ствараў работы, у якіх свежасць каларыту і мігатлівая вібрацыя мазка спалучаліся з рамантычнай прыўзнятасцю, дакладнасцю і яскравасцю характарыстык: партрэты У.Гранта («Канькабежац», 1782), місіс Перэс Мортан (1802). Строгай рэаліст. верагоднасцю вылучаюцца напісаныя з натуры партрэты Дж.Вашынгтона (1795). Пазнейшым варыянтам гэтага вобраза («Дж.Вашынгтон на Дорчэстэрскіх вышынях», 1806), а таксама заказным партрэтам ваен. дзеячаў (Дж.Манро, 1817) уласцівы высакароднасць і ўзнёслая рамантызацыя.



Г.**Сцюарт**. Партрэт Дж.Вашынгтона. 1795.

С.У.Пешын.

СЦЮА́РТ (Steuart, Stewart) Джэймс (21.10.1712, г. Эдынбург, Вялікабрытанія — 26.11.1780), англійскі эканаміст, адзін з найбуйнейшых прадстаўнікоў позняга *меркантылізму*. Асн. праца — «Даследаванне прынцыпаў палітычнай эканоміі» (1767). Лічыў крыніцай грамадскага багацця актыўны баланс знешняга гандлю. Паходжанне прыбытку не звязваў толькі з неэквівалентным абменам. Вылучаў т.зв. дадатны (ад «павелічэння працы, стараннасці і майстэрства») і адносны (ад рэалізацыі тавараў па цэнах вышэй вартасці) прыбытак, чым наблізіўся да праблемы *прыбавачнай вартасці*. Абгрунтаваў працэс *першапачатковага накаплення капіталу*. Крытыкаваў колькасную тэорыю грошай, прапанаваў канцэпцыю «ідэальнай грашовай адзінкі», дзе блытаў функцыю грошай як меры вартасці з маштабам цэн, а ідэальныя грошы разглядаў асобна ад рэальнага грашовага тавару (золата, серабра).

СЦЮА́РТ (Stewart) Роберт (н. 1942), касманаўт ЗША. З 1978 у групе касманаўтаў НАСА. Здзейсніў палёты ў складзе экіпажаў касм. караблёў (КК): 3—11.2.1984 на КК «Чэленджэр», 3—7.10.1985 на КК «Атлантыс». Правёў у космасе 12 сут.

СЦЮ́АРТЫ (Stuart, Stewart), каралеўская дынастыя ў Шатландыі (з 1371) і ў Англіі (1603—49, 1660—1714). Паходзілі са стараж. шатл. роду, прадстаўнікі якога ў 12 ст. займалі пасаду каралеўскага кіраўніка Шатландыі («сцюарта», адсюль назва). Дзякуючы шлюбу Уолтэра С. з дачкой шатл. караля, іх сын Роберт II у 1371 стаў шатл. каралём. Якаў IV С. [1488—1513] парадніўся з англ. каралеўскім родам, яго ўнучка *Марыя Сцюарт* прэтэндавала на англ. трон, але была пакарана смерцю. Якаў I [1603—25] і яго сын Карл I [1625—49] праводзілі палітыку ўмацавання абсалютызму, але не здолелі прадухіліць *англійскія рэвалюцыі 17 стагоддзя*, у час першай з іх Карл I пакараны смерцю, а Англія абвешчана рэспублікай. Пасля рэстаўрацыі манархіі С. (1660; Карл II, кароль у 1660—85) зноў занялі трон. Пераемнік Карла II Якаў II [1685—88] скінуты ў выніку дзярж. перавароту. Трон заняў Вільгельм III Аранскі [1689—1702], які правіў разам са сваёй жонкай — дачкой Якава II Марыяй II (каралева ў 1689—94). Пасля смерці Ганны С. [1702—14] трон перайшоў да *Ганноверскай дынастыі*. Род С. знік пасля смерці ўнука Якава II, кардынала Генрыха Бенядзікта (1807).

СЦЮДЗЁНАЕ МО́РА, старажытная назва *Паўночнага Ледавітага акіяна*.

СЦЯБЛО́, восевая частка парастка раслін, якая складаецца з *вузлоў* і *міжвузляў*. Маладое С. мае эпідэрму, першасную кару і *цэнтральны цыліндр* (стэлу); шматгадовае (напр., ствалы і галіны дрэў) мае другасную будову: *кара, луб, камбій, драўніна* з кольцамі гадавых прыростаў. У даўжыню расце за кошт верхавінкавай (у конусе нарастання) і ўставачных, або інтэркалярных *мерыстэм*, у таўшчыню — за кошт камбію (большасць двухдольных, голанасенныя). Нясе лісце, пупышкі і органы споранашэння, у пакрытанасенных — кветкі. Выконвае пераважна апорную і праводныя функцыі, забяспечвае зручнае для фотасінтэзу размяшчэнне лісця і двухбаковае перамяшчэнне рэчываў (ад каранёў да лісця, ад лісця да інш. органаў). Часам функцыянуе як орган назапашвання (клубні, сцёблы кактусаў), прымацавання да апоры (з дапамогай вусікаў), размнажэння (карэнішчы, сталоны), аховы (калючкі). У дрэвавых раслін С. наз. *ствалом*. Сцёбла-падобныя ўтварэнні трапляюцца ў некат. буйных водарасцей (бурых, зялёных).

СЦЯБЛО́ВЫ МАТЫЛЁК, кукурузны матылёк [Ostrinia (Pyrausta) nubilans], матылёк сям. агнёвак, мнагаедны шкоднік с.-г. культур. Пашыраны ў Еўразіі і Амерыцы. Пашкоджвае каля 230 відаў пераважна буйнасцябловых раслін, найб. кукурузу, каноплі, проса, хмель, таксама бульбу, сланечнік. У пашкоджаных раслін засыхаюць і пераломліваюцца сцёблы, суквецці, зніжаецца ўраджай зялёнай масы.

Крылы ў размаху 24—32 мм; у самак пярэднія ад светла-жоўтых да карычняватых, упоперак 2 цёмныя зігзагападобныя лініі; у самцоў крылы больш цёмныя. Яйцы адкладваюць на ніжнюю паверхню лісця. Вусені даўж. да 25 мм, светла-шэрыя, з цёмнай паласой уздоўж спіны, развіваюцца ў сцёблах. За год 2 пакаленні. Зімуюць дарослыя вусені ў расл. рэштках.



Сцябловы матылёк і яго вусень.

СЦЯГ, умацаванае на дрэўку палотнішча рознай формы і афарбоўкі з надпісамі, эмблемамі, упрыгожаннямі, якое служыць афіц. сімвалам дзяржавы (гл. *Сцяг дзяржаўны Рэспублікі Беларусь*), знакам адрознення якой-н. арг-цыі (грамадскай, дзярж., міжнар.), воінскай часці, злучэння, карабля (гл. *Сцяг воінскі*). Узнімаецца на будынках вярх. органаў дзярж. улады і кіравання, пасольстваў, консульстваў, на суднах, якія плаваюць у адкрытым моры і ў тэр. водах замежных дзяржаў і г.д. У пераносным сэнсе — ідэя, якая служыць асновай адзінства дзеянняў якой-н. групы, арг-цыі; светапогляд; праграма (напр., С. свабоды).

СЦЯГ ВО́ІНСКІ, знак, які аб'ядноўвае воінскую часць і ўказвае на яе прыналежнасць да ўзбр. сіл пэўнай дзяржавы; сімвал воінскіх гонару, доблесці і славы. Уяўляе сабой палотнішча пэўнага колеру і памеру, прымацаванае да дрэўка з метал. навершам (наканечнік накшталт кап'я ці інш. сімвалічнай выявы).

С.в. існавалі ў розных народаў, найб. стараж. ў краінах Усходу. Напачатку ролю С.в. выконвалі пэўныя фігуры (сава, сфінкс, арол і інш.), размешчаныя на версе дрэўка. У стараж. славян сцяг меў выгляд шаста з пучком травы ці конскай грывы на версе. У 9 ст. з'явіліся сцягі з тканіны (чатырох-, радзей трохабо шматвугольнае палотнішча, звычайна шматкаляровае з простым малюнкам, які добра чытаецца; мацавалася на дрэўку або рэйцы, шнуры); з 11 ст. мелі выявы гербаў (крыжоў) і пэўныя геральдычныя колеры. Асн. разнавіднасці: напр., *харугва* — старадаўняя назва баявых сцягоў у вайск. падраздзяленнях шэрагу краін, у т.л. ВКЛ; *штандар* — С.в. ў сярэдневякоўі ў кав. часцях і злучэннях армій Рас. і Герм. імперый і інш. Існуюць сцягі больш дробных памераў (значок, *вымпел*, гюйс і інш.). У Расіі да пач. 20 ст. назва, форма і колер С.в. неаднаразова мяняліся. Сцягі Чырв. Арміі існавалі з 1918, рабіліся з чырв. тканіны, мелі розныя памеры, змест і характар малюнкаў. У 1926 зацверджаны адзіны ўзор сцягоў часцей РСЧА. У Вял. Айч. вайну зацверджаны новыя ўзоры Чырв. сцягоў для воінскіх часцей і злучэнняў (21.12.1942), для гвардыі (11.6.1943), для часцей і злучэнняў ВМФ (5.2.1944). З 1975 С.в. стаў называцца Баявым Сцягам.



1



2



3



4

Да арт. **Сцяг воінскі**. 1—2 — харугвы атрадаў ВКЛ у Грунвальдскай бітве 1410; 3 — сцяг штаба злучэння партызанскіх атрадаў Мінскай вобласці. Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны; 4 — Баявы Сцяг воінскай часці Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.

На Беларусі С.в. вядомы з сярэдневякоўя. У час *Грунвальдскай бітвы 1410*, паводле апісання *Длугаша*, у войску ВКЛ 30 харугваў мелі выяву герба «*Па-*

гоня» на чырв. полі, а 10 — выяву герба *«Калюмны»* (белыя слупы або калоны на чырв. фоне). На карціне, прысвечанай *Аршанскай бітве 1514* (створана ў 1520-х г. невядомым аўтарам і захоўваецца ў музеі Войска Польскага ў Варшаве), паказаны не толькі дзярж. сцяг ВКЛ з выявай «Пагоні», але і белыя флюгеры з намаляваным чырв. крыжам св. Георгія. У 16 ст. на вял. харугве ВКЛ з шоўку (згодна з паведамленнем А.Гваніні, яна мела «сем локцяў кітайкі») была выява Божай Маці. Бела-чырвона-белы сцяг з'явіўся ў гады 1-й сусв. вайны 1914—18. С.в. (сцягі партызанскія) у 1918—20 і 1941—44 мелі партыз. атрады, палкі і брыгады, якія дыслацыраваліся на тэр. Беларусі.

С.в. (Баявы Сцяг) воінскай часці Узбр. Сіл Рэспублікі Беларусь складаецца з падвойнага прамавугольнага палотнішча чырвонага колеру, дрэўка з навершам і падтокам, шнура з кутасамі і сцягавых стужак. Уручаецца воінскай часці ад імя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Заўсёды захоўваецца ў часці, а на полі бою — у раёне баявых дзеянняў воінскай часці. С.в. служыць напамінам кожнаму ваеннаслужачаму аб гераічных традыцыях і свяшчэнным абавязку абароны Айчыны. Пры страце Баявога Сцяга камандзір часці і непасрэдныя віноўнікі падлягаюць ваен. суду, а вайск. часць расфарміроўваецца.

Літ.: Устав внутренней службы Вооруженных Сил Республики Беларусь. Мн. 2001; Шатунов Г.П. Символ воинской чести, доблести и славы. М., 1975; Маковеев М.С. О знамени: которому присягаем. М., 1974; Топильский В.Ф. Знамя части. Л., 1974; Басаў А.Н., Куркоў І.М. Флагі Беларусі ўчора і сёння. Мн., 1994.

С.А.Фамін, В.А.Юшкевіч.

СЦЯГ ДЗЯРЖА́ЎНЫ РЭСПУ́БЛІКІ БЕЛАРУ́СЬ, сімвал дзярж. суверэнітэту Рэспублікі Беларусь. Быў устаноўлены Законам Рэспублікі Беларусь ад 19.9.1991. Палажэнне аб сцягу зацверджана Пастановай Вярх. Савета Рэспублікі Беларусь ад 11.12.1991. Уяўляў сабой прамавугольнае палотнішча, якое складалася з 3 гарызантальна размешчаных палос аднолькавай шырыні: верхняй і ніжняй — белага, сярэдняй — чырв. колеру. Адносіны шырыні і даўжыні сцяга 1 : 2. Сцяг мацаваўся на дрэўку (флагштоку), якое фарбавалася ў залацісты (вохра) колер. Пры цырыманіялах і інш. урачыстых мерапрыемствах сцяг выкарыстоўваўся з навершам ромбападобнай формы з выявай крыжа. Па выніках праведзенага 14.5.1995 рэсп. рэферэндуму, адным з пытанняў якога было ўстанаўленне новых *Герба дзяржаўнага Рэспублікі Беларусь* і Сцяга дзяржаўнага, Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 7.6.1995 зацверджана Палажэнне аб сцягу. Уяўляе сабой прамавугольнае палотнішча, якое складаецца з дзвюх гарызантальна размешчаных каляровых палос: верхняй — чырв. колеру шырынёй у $^{2}/_{3}$ і ніжняй — зялёнага колеру ў $^{1}/_{3}$ шырыні сцяга. Каля дрэўка вертыкальна размешчаны бел. нац. арнамент чырв. колеру на белым полі, якое складае $^{1}/_{9}$ даўжыні сцяга. Адносіны шырыні сцяга да яго даўжыні 1 : 2. Сцяг мацуецца на дрэўку (флагштоку), якое фарбуецца ў залацісты (вохра) колер. Пры цырымоніях і інш. урачыстых мерапрыемствах Дз.с.Р.Б. выкарыстоўваецца з навершам ромбападобнай формы з выявай пяціканцовай зоркі, аналагічнай яе выяве на Гербе дзяржаўным Рэспублікі Беларусь. Навершы вырабляюцца з металу жоўтага колеру.



Сцяг дзяржаўны Рэспублікі Беларусь.

Літ.: Заканадаўчыя акты аб дзяржаўнай сімволіцы Рэспублікі Беларусь. 2 выд. Мн., 1994; Басаў А.Н., Куркоў І.М.Флагі Беларусі ўчора і сёння. Мн., 1994; Дзяржаўны герб і Дзяржаўны флаг Рэспублікі Беларусь. Мн., 1997.

СЦЯГ ПЕРАМО́ГІ, чырвоны сцяг, які быў узняты 30.4.1945 разведчыкамі 756-га стралк. палка 150-й стралк. дывізіі (1-ы Бел. фронт) М.А.*Ягоравым* і М.В.Кантарыя над будынкам рэйхстага ў Берліне; сімвал перамогі сав. народа і яго Узбр. Сіл у Вял. Айч. вайне 1941—45 над ням. фашызмам. Захоўваецца ў Цэнтр. музеі ўзбр. сіл (Масква).



Разведчыкі 756-га палка 150-й стралковай дывізіі М.А.Ягораў (справа) і М.В.Кантарыя са **Сцягам Перамогі**. Берлін. Май 1945.

СЦЯКЛО́Ў Уладзімір Андрэевіч (9.1.1864, г. Ніжні Ноўгарад, Расія — 30.5.1926), расійскі матэматык, арганізатар і гісторык навукі; заснавальнік навук. школы па матэм. фізіцы. Акад. Пецярбургскай АН (1912, чл.-кар. 1902). Замежны ганаровы чл. Гётынгенскай АН (1925). Скончыў Харкаўскі ун-т (1887), дзе працаваў з 1889 (з 1896 праф.). З 1906 у Пецярбургскім ун-це. У 1919—26 віцэ-прэзідэнт АН СССР, арганізатар і з 1921 дырэктар Фізіка-матэм. ін-та АН СССР. Навук. працы па матэм. фізіцы, матэм. аналізе, тэорыі пругкасці, гідрадынаміцы і гісторыі матэматыкі. Аўтар кніг і нарысаў аб навук. творчасці М.В.Ламаносава, Г.Галілея, М.І.Лабачэўскага, А.Пуанкарэ, П.Л.Чабышова і інш. Яго імем названы Матэм. ін-т АН СССР (1934).

Тв.: Основные задачи математической физики. 2 изд. М., 1983.

Літ.: Владимиров В.С., Маркуш И.И. В.А.Стеклов — ученый и организатор науки. М., 1981.

СЦЯКО́ЛЬНІКАЎ Аляксандр Фёдаравіч (н. 9.10.1952, с. Заворскла Палтаўскай вобл., Украіна), бел. вучоны ў галіне фізікі плазмы і тэхналогіі мікраэлектронікі. Д-р фіз.-матэм. н. (1993). Скончыў Мінскі радыётэхн. ін-т (1974). З 1974 у Бел. ун-це інфарматыкі і радыёэлектронікі (у 1988—2001 заг. лабараторыі). Навук. працы па фізіцы плазмы, вакуумнай і плазменнай электроніцы, плазмахіміі, плазменных тэхналогіях. Распрацаваў абагульненую мадэль экстракцыі іоннага пучка з плазмы, развіў тэорыю іоннага кластэраўтварэння ў працэсе стымуляванага плазмай асаджэння плёнак крэмнію.

Тв.: Граничное условие для электрического поля на движущейся поверхности раздела плазма — ионный пучок // Журн. технич. физики. 1983. Т. 53, №11; Исследование динамики бесстолкновительного приэлектродного слоя пространственного заряда в плазме высокочастотного разряда // Физика плазмы. 1991. Т. 17, вып. 12.

СЦЯНА́ будынка, асноўная вертыкальная *агараджальная канструкцыя* будынка (збудавання).

Адрозніваюць С.: вонкавыя і ўнутраныя; нясучыя (успрымаюць нагрузку ад *перакрыццяў, пакрыццяў*, ціску ветру і інш.), саманясучыя (спалучаны з *каркасам* будынка і ўспрымаюць нагрузку ад уласнай вагі ў межах усіх паверхаў) і ненясучыя (перагародкі, успрымаюць нагрузку ад ўласнай вагі ў межах аднаго паверха); зборныя (буйнапанэльныя і буйнаблочныя, гл. *Зборныя канструкцыі*), маналітныя (найчасцей бетонныя, гл. *Маналітныя канструкцыі*) і ручной муроўкі (цагляныя, каменныя, блочныя). Робяцца са *сценавых матэрыялаў*. Ад дзеяння грунтавой вільгаці паверхня С. ахоўваецца *гідраізаляцыяй*.

«СЦЯНА́ КАМУНА́РАЎ», сцяна могілак *Пер-Лашэз* у Парыжы, каля якой у 1871

былі расстраляны абаронцы *Парыжскай камуны 1871* (адсюль назва). Каля пастаўленага на гэтым месцы помніка пахаваны таксама П.*Лафарг*, М.*Тарэз*, А.*Барбюс* і інш. дзеячы рабочага руху, удзельнікі *руху Супраціўлення* ў 2-ю сусв. вайну.

СЦЯНЬКО́ Віктар Георгіевіч (н. 21.6.1949, в. Пліса 2-я Навагрудскага р-на Гродзенскай вобл.), бел. вучоны ў галіне хірургіі. Д-р мед. н. (1990), праф. (1992). Скончыў Гродзенскі мед. ін-т (1976). З 1983 у НДІ анкалогіі і мед. радыялогіі. З 1985 у Гродзенскім мед. ін-це (з 1999 заг. кафедры). Навук. працы па выкарыстанні лазераў у хірургіі анарэктальнай вобласці.

Тв.: Применение лазеров в хирургии аноректальной области. М., 1991 (у сааўт.).

СЦЯПА́НАВА Алена Андрэеўна (17.5.1891, Масква — 26.5.1978), расійская спявачка (каларатурнае сапрана). Нар. арт. СССР (1937). Спявала ў царк. хоры. З 1908 артыстка хору, у 1912—48 салістка Вял. т-ра ў Маскве. Была бліскучай выканаўцай жаночых партый у операх М.Рымскага-Корсакава: Валхава, Снягурачка, Шамаханская царыца, Царэўна-Лебедзь («Садко», «Снягурачка», «Залаты пеўнік», «Казка пра цара Салтана»). Выступала як канцэртная спявачка.



А.А.**Сцяпанава**.



А.В.**Сцяпанава**.

СЦЯПА́НАВА Ангеліна Восіпаўна (н. 23.11.1905, г. Нікалаеўск-на-Амуры Хабараўскага краю, Расія), расійская актрыса. Жонка А.*Фадзеева*. Нар. арт. СССР (1960). Герой Сац. Працы (1975). Вучылася ў 3-й Студыі Маскоўскага Маст. т-ра. З 1924 актрыса Маскоўскага Маст. акад. т-ра. Творчасць вызначаецца вытанчанасцю псіхал. аналізу вобраза ў спалучэнні з гратэскавай вастрынёй. Сярод роляў: Зінаіда («Дзядзечкаў сон» паводле Ф.Дастаеўскага), Ірына, Аркадзіна («Тры сястры», «Чайка» А.Чэхава), каралева Лізавета («Марыя Сцюарт» Ф.Шылера), Сабурава («Адзіны сведка» А. і П.Тур), Патрык Кэмпбел («Мілы лгун» Дж.Кілці), прынцэса Касманопаліс («Салодкагалосая птушка юнацтва» Т.Уільямса), Каханка («Усё скончана» Э.Олбі) і інш. Здымалася ў кіно: «Вайна і мір», «Дваццаць дзён без вайны», «Прызнанне ў каханні» і інш. Дзярж. прэміі СССР 1952, 1977.



«Сцяна камунараў» у Парыжы. Скульптар П.А.Барталаме. 1899.

СЦЯПА́НАВА Альбіна Мікалаеўна (н. 21.7.1929, г. Паўлава Ніжагародскай вобл., Расія), бел. моўазнавец. Засл. дз. нав. Беларусі (1998). Д-р філал. н. (1979). Праф. (1981). Скончыла Горкаўскі ін-т замежных моў (1951). З 1965 у Мінскім лінгвістычным ун-це. Даследуе праблемы семантыкі, тэорыі рэферэнцыі, семантычнага і прагматычнага сінтаксісу франц. мовы, тэорыі часу і часавай прасторы таго, хто гаворыць. Аўтар кніг «Да праблемы граматычнай формы і граматычнай катэгорыі» (1972), «Структура і ўзаемадзеянне форм функцыянальна-семантычнай катэгорыі акалічнасці спосабу дзеяння ў сучаснай французскай мове» (1973), «Прамарфалагічныя адзінкі французскай мовы» (1975), «Нарысы-роздумы і цытацыі пра прагмасінтаксіс французскай мовы: імя і яго дэтэрмінатывы» (2000) і інш. Сааўтар «Практыкума па тэарэтычнай граматыцы французскай мовы» (1986), кн. «Функцыянаванне і развіццё моўных сістэм» (1990), «Актуальныя пытанні мовазнаўства і інтэнсіфікацыі выкладання замежных моў» (1993), «Вучэбныя граматыкі нацыянальных моў» (1996) і інш.

СЦЯПА́НАВА Лідзія Ільінічна (22.1.1899, Масква — 13.11.1962), расійскі рэжысёр дакумент. кіно. У кіно з 1925. З 1953 на студыі «Маснавукфільм». Работы С. адлюстроўвалі важныя падзеі ў жыцці краіны: «Ёсць метро» (1932), «Савецкая жанчына» (1937), «Моладзь абараняе Радзіму» (1942), «Арлоўская бітва» (1944), «Савецкі Казахстан» (1951) і інш. Дзярж. прэміі СССР 1947, 1948, 1949, 1950, 1952.

СЦЯПА́НАВА Таццяна Пятроўна (н. 9.5.1935, Мінск), бел. цымбалістка, педагог. Засл. арт. Беларусі (1975). Скончыла Бел. кансерваторыю (1959, кл. І.*Жыновіча*). З 1954 артыстка Дзярж. нар. аркестра Беларусі, у 1969—93 выкладчык Мінскага муз. вучылішча, адначасова ў 1974—82 арганізатар і кіраўнік цымбальнага ансамбля. Аўтар перапрацэнняў твораў бел., рус. і інш. кампазітараў, у т.л. канцэртнай фантазіі «Журавлі на Палессе ляцяць» І.Лучанка, «Раманса» Г.Свірыдава (з муз. ілюстрацыі да аповесці А.Пушкіна «Мяцеліца»), уверцюры да оперы «Квартал анёлаў» М.Тэадаракіса і інш. Лаўрэат Усесаюзнага конкурсу артыстаў эстрады (1974, Масква). *А.В.Скорабагатчанка.*

СЦЯПА́НАВА УНІВЕРСА́ЛЬНЫЯ СУАДНО́СІНЫ, заканамернасць, паводле якой адносіны магутнасці люмінесцэнцыі складаных малекул да каэфіцыента паглынання імі святла той жа частаты выражаюцца універсальнай функцыяй частаты і т-ры. Устаноўлены Б.І.*Сцяпанавым*, выконваюцца пры раўнаважным размеркаванні малекул па вагальных узроўнях узбуджанага і асноўнага электронных станаў, у якіх малекулы адпаведна выпрамяняюць і паглынаюць святло. С.у.с. з'яўляюцца аналагам *Кірхгофа закона выпрамянення* пры адсутнасці раўнаважнага размеркавання малекул па электронных станах.

Літ.: Степанов Б.И., Грибковский В.П. Введение в теорию люминесценции. Мн., 1963.

СЦЯПА́НАВІЧЫ, вёска ў Зайкаўскім с/с Гарадоцкага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса. За 50 км на ПнУ ад горада і 47 км ад чыг. ст. Гарадок, 89 км ад Віцебска. 183 ж., 79 двароў (2002). Клуб, б-ка, аддз. сувязі. Каля вёскі гарадзішча *днепра-дзвінскай культуры*.

СЦЯПА́НАЎ Аляксандр Мікалаевіч (2.2.1892, г. Адэса, Украіна — 30.10.1965), рускі пісьменнік. Скончыў Пецярбургскі тэхнал. ін-т (1913). Друкаваўся з 1938. У шматпланавым рамане «Порт-Артур» (кн. 1—2, 1940—41, Дзярж. прэмія Расіі 1946; аднайм. п'еса ў сааўт. з І.Паповым, 1946) і яго працягу — рамане «Сям'я Званаровых» (1959—63, незавершаны) гераізм рус. салдат і афіцэраў у рус.-японскай вайне

1904—05, абвастрэнне сац. канфліктаў у рус. грамадстве. Аўтар аповесцей «Адмірал Макараў у Порт-Артуры» (1947), «Стальны рабочы атрад» (1958), дарожных нататак. Інсцэніроўку рамана «Порт-Артур» у 1963 ажыццявіў Гродзенскі абл. драм. т-р.

Тв.: Порт-Артур. Кн. 1—2. Мн., 1985; Семья Звонаревых. Кн. 1—2. М., 1993.

Літ.: Веленгурин Н. Александр Степанов и его книга о «Порт-Артуре». М., 1965; Иншаков П. Александр Степанов. Краснодар, 1974.



Б.І.**Сцяпанаў**.



С.Я.**Сцяпук**.

СЦЯПА́НАЎ Барыс Іванавіч (28.4.1913, С.-Пецярбург — 7.12.1987), бел. фізік; заснавальнік навук. школы па спектраскапіі і лазернай фізіцы. Акад. АН Беларусі (1953), д-р фіз.-матэм. н. (1949), праф. (1953). Герой Сац. Працы (1973). Засл. дз. нав. Беларусі (1967). Скончыў Ленінградскі ун-т (1936). З 1934 у Дзярж. аптычным ін-це (Ленінград). З 1953 у Ін-це фізікі АН Беларусі (у 1957—85 дырэктар). Адначасова ў 1953—67 заг. кафедры ў БДУ. У 1964—87 гал. рэдактар «Журнала прикладной спектроскопии». Навук. працы па тэарэт. спектраскапіі, люмінесцэнцыі, лазернай фізіцы, галаграфіі, оптыцы рассейвальных асяроддзяў, гісторыі навукі. Распрацаваў тэорыю ваганняў шмататамных малекул, квантава-мех. тэорыю люмінесцэнцыі складаных малекул, асновы спектраскапіі адмоўных светлавых патокаў і тэорыю адмоўнай люмінесцэнцыі. Вывеў універсальныя суадносіны паміж спектрамі паглынання і выпрамянення складаных малекул і паўправаднікоў (1957; *Сцяпанава універсальныя суадносіны*). Пад яго кіраўніцтвам даследавана з'ява аптычнай генерацыі ў растворах складаных арган. злучэнняў, створаны *лазеры* новага тыпу з плаўнай пераналадкай частаты ў шырокім дыяпазоне спектра, распрацаваны фіз. асновы дынамічнай галаграфіі і новыя метады пераўтварэння прасторавай структуры светлавых пучкоў. Яго імем названы Ін-т фізікі Нац. АН Беларусі. Дзярж. прэміі СССР 1950, 1972, 1982. Дзярж. прэмія Беларусі 1976. Залаты медаль імя С.І.Вавілава АН СССР (1967).

Тв.: Основы спектроскопии отрицательных световых потоков. Мн., 1961; Методы расчета оптических квантовых генераторов. Т. 1—2. Мн., 1966—68 (у сааўт.); Колебания молекул. 2 изд. М., 1972 (у сааўт.); Очерки по истории оптической науки. Мн.,1978; Лазеры на красителях. М., 1979; Введение в современную оптику. [Т. 1—5]. Мн., 1989—91.

Літ.: Биобиблиографический указатель научных трудов академика АН БССР Б.И.Степанова. Мн., 1983; Б.І.Сцяпанаў // Весці АН Беларусі. Сер. фіз.-мат. навук. 1993. № 2.

А.І.Болсун.

СЦЯПА́НАЎ Барыс Міхайлавіч (31.1.1927, г. Петрапаўлаўск, Казахстан — 27.11.1992), бел. кінарэжысёр. Засл. дз. маст. Беларусі (1974). Скончыў Усесаюзны дзярж. ін-т кінематаграфіі (1956). З 1956 працаваў на кінастудыі «Беларусьфільм». Фільмы С. вызначаюцца грамадзянскасцю, эмацыянальнасцю выразных сродкаў, моцнымі, неадназначнымі характарамі, спалучэннем рэаліст. плыні падзей з лірыка-рамант. інтанацыяй. Сярод работ: «Апавяданні пра юнацтва» (1961), «Альпійская балада» (1966, прыз на Міжнар. кінафестывалі ў Дэлі, 1968), «Я, Францыск Скарына» (1970), «Бацька» (1971), «Воблакі» (1973), «Воўчая зграя» (1975), «Гарантую жыццё» (1978); фільмы «Мы наш, мы новы...» і «Мірнае лета 21 года...» (1980), «Усходні рубеж» (1982), «Чырвоны пясок» (1984) у тэлесерыяле «Дзяржаўная граніца».

А.А.Карпілава.

СЦЯПА́НАЎ Васіль Іванавіч (13.3.1903, с. Залатое Краснаармейскага р-на Саратаўскай вобл., Расія — 22.5.1979), бел. філосаф. Чл.-кар. АН Беларусі (1967), д-р філас. н. (1960), праф. (1961). Засл. дз. нав. Беларусі (1977). Скончыў Акадэмію камуніст. выхавання імя Крупскай (1932). У 1935—42 у Сталінградскім пед. ін-це. З 1947 у БДУ (у 1962—67 прарэктар). Даследаваў законы і катэгорыі дыялектыкі ў адзінстве з тэорыяй пазнання і логікай, іх значэнне ў развіцці прыродазнаўчых навук, філас. і сацыялагічныя погляды В.Р.Бялінскага, некаторыя праблемы тэорыі змянення сац. структуры грамадства і інш. Аўтар прац па гісторыі рус. філасофіі і грамадска-паліт. думкі.

Тв.: Философские и социологические воззрения В.Г.Белинского. Мн., 1959; О «Философских тетрадях» В.И.Ленина. М., 1959 (у сааўт.); Роль интеллигенции в формировании нового духовного облика народа // Структура советской интеллигенции. Мн., 1970; Вопросы диалектического материализма. Мн., 1976 (у сааўт.).

СЦЯПА́НАЎ Павел Іванавіч (16.6.1880, г. Тара Омскай вобл., Расія — 26.8.1947), расійскі геолаг. Акад. АН СССР (1939). Скончыў Пецярбургскі горны ін-т (1907). З 1907 у Геал. к-це, з 1919 у Ленінградскім горным ін-це. З 1926 дырэктар Геал. музея імя Ф.М.Чарнышова, адначасова з 1939 у Ін-це геал. навук АН СССР. Навук. працы па геалогіі вугальных бас. СССР. Выказаў ідэю «Вял. Данбаса», што садзейнічала выяўленню шэрагу новых вугальных радовішчаў і пашырэнню межаў Данбаса. Распрацаваў канцэпцыю паясоў і вузлоў вугленамнажэння. Дзярж. прэмія СССР 1943.

СЦЯПА́НКІ, вёска ў Жабінкаўскім р-не Брэсцкай вобл., на аўтадарозе Жабінка—Арэпічы. Цэнтр сельсавета і с.-г. калект. прадпрыемства. За 10 км на Пн ад горада і чыг. ст. Жабінка, 36 км ад Брэста. 245 ж., 100 двароў (2002). Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Магіла ахвяр фашызму. Помнік архітэктуры — Свята-Міхайлаўская царква (да 1780).

СЦЯПНЯ́К-КРАЎЧЫ́НСКІ (сапр. Краўчынскі) Сяргей Міхайлавіч (13.7.1851, с. Новы Страдуб Пятроўскага р-на Кіраваградскай вобл., Украіна — 23.12.1895), рускі рэвалюцыянер-народнік, пісьменнік. Скончыў Міхайлаўскае артыл. вучылішча ў Пецярбургу (1870), вучыўся ў Лясным ін-це (1871—73). У 1872 чл. рэв. гуртка «*чайкоўцаў*». Увосень 1873 хадзіў у «народ». Быў арыштаваны, уцёк, у 1874 эмігрыраваў. Летам 1875 удзельнічаў у *Герцагавінска-Баснійскім паўстанні 1875—78*, супрацоўнічаў у газ. «Работник» (Жэнева). За ўдзел ва ўзбр. паўстанні ў італьян. правінцыі Беневента ў 1877 арыштаваны, амнісціраваны. З мая 1878 нелегальна жыў у Пецярбургу, быў чл. «*Зямлі і волі*», рэдагаваў 1-ы нумар час. «Земля и воля». 4.8.1878 забіў шэфа жандараў Н.В.Мезянцова. З 1878 у эміграцыі (Швейцарыя, Італія, з 1884 у Лондане). У пач. 1880-х г. далучыўся да «*Народнай волі*», але разыходзіўся з яе членамі па многіх пытаннях. У 1891 у Лондане заснаваў «Фонд вольнай рускай прэсы», арганізаваў англ. «Т-ва сяброў рускай свабоды» (1890), рэдагаваў яго орган — час. «Free Russia» («Свабодная Расія», вып. 1—3, 1890—92). У 1890-я г. адмаўляў тэрор як метад паліт. барацьбы. Аўтар гісторыка-публіцыст. кн. «Падпольная Расія» (1881—82 на італьян. мове; рус. пер. аўтара 1893), «Расія пад уладай цароў» (1885, на англ. мове, рус. пер. 1965), рамана «Андрэй Кожухаў» («Шлях нігіліста», 1889; рус. пер. 1898), аповесці «Домік на Волзе» (1889), драм, прапагандысцкіх казак, нарысаў і інш. Яго творчасці ўласцівы рамантычныя адносіны да рэчаіснасці, эмацыянальнасць, рэв. пафас.

Тв.: Соч. 1—2. М., 1958; Избранное. М., 1972.

Літ.: Маевская Т.П. Слово и подвиг: Жизнь и творчество С.М.Степняка-Кравчинского. Киев, 1968.

СЦЯПУ́К Леанід Якаўлевіч (н. 18.2.1941, в. Камень Лепельскага р-на Віцебскай вобл.), бел. вучоны ў галіне механізацыі сельскай гаспадаркі. Д-р тэхн. н. (1992), праф. (1998). Вынаходнік СССР (1985). Скончыў Бел ін-т механізацыі сельскай гаспадаркі (1965). У 1967—75 і 1978—83 у Цэнтр. НДІ механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі Нечарназёмнай зоны СССР (Мінск). З 1983 у Бел. НДІ механізацыі сельскай гаспадаркі (у 1983—98 нам. дырэктара, з 1998 заг. лабараторыі). Навук. працы па механізацыі працэсаў прыгатавання кармоў для розных відаў жывёл, працэсаў хімізацыі сельскай гаспадаркі.

Тв.: Механизация получения и применение многокомпонентных сельскохозяйственных материалов. Мн., 1990; Механизация процессов химизации и экология. Мн., 1993 (разам з І.С.Нагорскім, В.П.Дзмітрачковым).

СЦЯПУ́К Сямён Яфімавіч (26.1.1911, в. Гарадзішча Петрыкаўскага р-на Гомельскай вобл., — 11.3.1988), Герой Сав. Саюза (1944). Скончыў курсы мал. лейтэнантаў (1942). У 1936—41 у органах НКУС. У Вял. Айч. вайну з 1941 на Паўд.-Зах., Варонежскім, 1-м і 4-м Укр. франтах, удзельнік Сталінградскай бітвы, вызвалення Украіны, Малдовы, Польшчы, Чэхаславакіі. Камандзір роты аўтаматчыкаў ст. лейтэнант С. вызначыўся ў вер. 1943 пры фарсіраванні Дняпра і захопе плацдарма на Пн ад Кіева. Да 1960 у органах МУС БССР.

СЦЯРВЯ́ТНІК звычайны (Neophron percnopterus), птушка сям. ястрабіных атр. сокалападобных, з групы *грыфаў*. Пашыраны ў Паўд. Еўропе, Азіі, Афрыцы. Жыве ў разнастайных ландшафтах. Гняздуецца ў нішах скал. На Беларусі рэдкі залётны від.

Даўж. да 75 см, маса да 2,5 кг. Дзюба доўгая, тонкая. Пярэдняя ч. галавы і валляк голыя. На патыліцы чубок з падоўжаных пёраў. Афарбоўка белаватая, у маладых птушак бурая; махавыя пёры чорныя. Крылы доўгія, хвост клінападобны. Корміцца пераважна мярцвячынай, адкідамі. Адкладвае 1—2 яйцы.

Э.Р.Самусенка.



Сцярвятнік звычайны.

СЦЯЦКО́ Павел Уладзіміравіч (н. 5.3.1930, в. Грабава Зэльвенскага р-на Гродзенскай вобл.), бел. мовазнавец. Д-р філал. н. (1980), праф. (1983). Скончыў Гродзенскі пед. ін-т (1953), працаваў у ім, потым у Мінскім пед. ін-це. З 1981 заг. кафедры Гомельскага, з 1990 — Гродзенскага ун-таў. Даследуе праблемы лексікалогіі, фаналогіі словаўтварэння, этымалогіі, граматыкі бел. літ. мовы, дыялекталогіі. Аўтар «Дыялектнага слоўніка: (З гаворак Зэльвеншчыны)» (1970), кн. «Народная лексіка» (1970), «Народная лексіка і словаўтварэнне» (1972), «Беларускае народнае словаўтварэнне: Афіксальныя назоўнікі» (1977); сааўтар «Беларускай граматыкі» (ч.1, 1985), «Руска-беларускага слоўніка лінгвістычных тэрмінаў» (1988), «Слоўніка лінгвістычных тэрмінаў» (з М.Ф.Гуліцкім, Л.А.Антанюк, 1990), «Руска-беларускага фізічнага слоўніка» (з А.М.Каладзінскім, Д.М.Карацінскай, 1999), кн. «Слоўнік тэрміналогіі лінгвістычнай: беларуска-расійска-польскі і польска-расійска-беларускі» (на польскай мове, 1994), навучальных дапаможнікаў для ВНУ.

Тв.: Пачатковы курс мовазнаўства. Гродна, 1993; Праблемы нормы, культуры мовы. Гродна, 1998; Праблемы лексічнага нармавання беларускай мовы. Гродна, 1999; Уводзіны ў мовазнаўства. Гродна, 2001; Культура мовы. Мн., 2002.

Літ.: Прафесар П.У.Сцяпко: Бібліягр. агляд навук.-пед. дзейнасці ў галіне бел. і слав. мовазнаўства. Гродна, 2000. *І.У.Саламевіч.*

СЦЯШКО́ВІЧ Таццяна Піліпаўна (25.12.1904, г. Чэрвень Мінскай вобл. — 6.11.1986), бел. мовазнавец. Засл. настаўніца Беларусі (1947). Канд. філал. н. (1956). Скончыла БДУ (1930). Працавала настаўніцай, у 1947—83 у Гродзенскім ун-це (у 1957—74 заг. кафедры). Даследавала дыялекталогію і гісторыю бел. мовы, дыялектную лексіку, мову твораў К.Крапівы, М.Лынькова. Аўтар прац «Гаворкі Ваўкавыскага раёна Гродзенскай вобласці. БССР» (1959), «З назіранняў над мовай К.Крапівы» (1961), «Мова эпапеі Міхася Лынькова «Векапомныя дні» (1965), «Матэрыялы да слоўніка Гродзенскай вобласці» (1972), «Займеннік у беларускай мове» (1977), «Слоўнік Гродзенскай вобласці» (1983).

СЧАПЛЯ́НКІ, група зялёных водарасцей, тое, што *кан'югаты*.

СЫВАРАТА́ЧНАЯ ХВАРО́БА, алергічнае захворванне, якое развіваецца пасля ўвядзення ў арганізм лячэбна-прафілакт. *сываратак імунных* (напр., супраць слупняку, дыфтэрыі, батулізму), *імуналабулінаў*, лек. сродкаў (напр., інсуліну). Увядзенне гэтых прэпаратаў індуцыруе выпрацоўку *антыцелаў* і ўтварэнне комплексу *антыген* і антыцела, што выклікае запаленне. Прыкметы: ліхаманка, галаўны боль, скурная высыпка, сверб, прыпуханне суставаў, павелічэнне лімфавузлоў, селязёнкі і інш. Лячэнне тэрапеўтычнае. *І.М.Семяненя.*

СЫВАРА́ТКІ ІМУ́ННЫЯ, антысываркі, лекавыя прэпараты, атрыманыя з крыві чалавека ці жывёл. Маюць у сабе *антыцелы* да розных *антыгенаў*. Атрымліваюць пасля імунізацыі спецыфічнымі антыгенамі або перанесеных інфекц. захворванняў. Адрозніваюць С.і. дыягнастычныя і лячэбна-прафілакт., якія падзяляюць на антыбактэрыяльныя, антывірусныя, антытаксічныя (супраць таксінаў бактэрый, ядаў змей, павукоў, раслін). Да лячэбна-прафілакт. С.і. адносяць таксама *імуналабуліны* (прафілактыка і лячэнне грыпу, сібірскай язвы, шаленства і інш.). Выкарыстоўваюць таксама для вызначэння антыгеннага саставу біял. тканак (групы крыві, антыгены трансплантантаў, пухлін). *І.М.Семяненя.*

СЫГНЕ́Т, сыгнець, сегніць, сігніт (ад лац. signum знак), пярсцёнак-пячатка. У ВКЛ найб. пашыраны ў 16—17 ст. сярод шляхты і мяшчан. Меў выяву герба або знака-кляйна. Уладальнік С. трымаў яго звычайна пры сябе, насіў у кашальку ці на мезеным пальцы левай рукі. С. часта выраблялі з каштоўных металаў, аздаблялі самацветамі. Статут ВКЛ 1588 абмяжоўваў колькасць С., якія магла мець пры сабе пэўная асоба. *А.К.Цітоў.*

СЫДЗЬКО́ Міхаіл Пятровіч (18.9.1906, в. Сініцкае Поле Лельчыцкага р-на Гомельскай вобл. — 30.4.1983), Герой Сав. Саюза (1945). Скончыў курсы: Ві-



М.П.**Сыдзько**.

цебскія мал. лейтэнантаў (1936), «Выстрал» (1943), удасканалення каманднага саставу (1949). У Чырв. Арміі з 1928. У Вял. Айч. вайну з 1941 на фронце, удзельнік баёў пад Масквой, Сталінградам, у Крыме, Прыбалтыцы, Германіі. Стралк. полк на чале з падпалкоўнікам С. вызначыўся 9.4—9.5.1944 пры вызваленні Крыма, у ліку першых уварваўся ў г. Севастопаль. Да 1954 у Сав. Арміі. Ганаровы грамадзянін г.п. Лельчыцы.

СЫДЫКБЕ́КАЎ Тугельбай (н. 14.5.1912, Цюпскі р-н Ісык-Кульскай вобл., Кіргізія), кіргізскі пісьменнік. Нар. пісьменнік Кіргізіі (1968). Акад. АН Кіргізіі (1954). Вучыўся ў зоавет. ін-це ў Ашгабаце. Друкуецца з 1930. Тэма працы ў зб-ках паэзіі «Барацьба» (1933), «Героі» (1936), «Паэт-салавей» (1938), «Зварот да чалавека» (1969), «На перавале» (1980). Аўтар раманаў «Людзі нашых дзён» (1948, Дзярж. прэмія СССР 1949), «Сярод гор» (кн. 1—2, 1955—58), «Жанчыны» (кн. 1—2, 1962—66), «Равеснікі» (1977), аўтабіягр. кн. «Шлях» (1982).

Тв.: Рус. пер. — Соч. Т. 1—4. Фрунзе, 1969—70; Исповедь Букентай. М., 1980.

Літ.: Даронян С.К. Тугельбай Сыдыкбеков. М., 1966.

СЫ́ЗРАНЬ, горад у Самарскай вобл. Расіі, порт на р. Волга (Саратаўскае вадасх.). Засн. ў 1683 як крэпасць. 187 тыс. ж. (2000). Чыг. вузел. Каля С. аўтадарога Масква—Самара. Прам-сць: нафта- і сланцаперапр., нафтахім. і хім. (ВА «Пластык», з-д тэхн. вугляроду), машынабуд. (з-ды турбабуд., «Сызрань-сельмаш»), лёгкая, харчовая. Мэблевая ф-ка. Філіял Самарскага політэхн. ін-та. Драм. тэатр. Краязн. музей. Арх. помнікі 17 — пач. 20 ст.

СЫКТЫЎКА́Р, горад, сталіца Рэспублікі Комі ў Расіі, прыстань на р. Сысала

(пры яе ўпадзенні ў Вычэгду). Вядомы з 1586. 230 тыс. ж. (2000). Чыг. станцыя. Буйны лесапрамысл. комплекс: цэлюлозна-папяровая і кардонная вытв-сць, гідралізна-дражджавы з-д, лесапільна-дрэваапр. камбінат, мэблевае ВА «Поўнач»; з-ды: суднабуд. і суднарамонтны, доследна-суднамех., ляснога машынабудавання; ф-ка нятканых матэрыялаў; прадпрыемствы буд. матэрыялаў, лёгкай і харч. прам-сці. Комі філіял Расійскай АН з ВНУ, у т.л. ун-т. Тэатры: музычны, драматычны. Музеі: маст., гіст.-краязн., геал., літ.-мемарыяльны паэта-дэмакрата І.А.Куратава.

выступленні бел. дэпутатаў у польскім сейме, справаздачы пра мітынгі ў Гарадку і Беластоку, інфармавала пра работу Бел. нац. к-та ў Вільні. Да 10-й гадавіны з пач. 1-й сусв. вайны змясціла антываен. публікацыі, у якіх асуджалася палітыка дзяржаў, што развязалі вайну. Падтрымлівала змаганне за бел. школы, культуру як сродак сац. і нац. ўсведамлення народа. Паведамляла пра жыццё беларусаў у Чэхаславакіі, Латвіі, Сербіі, БССР і ЗША. Змясціла ўспаміны пра Ф.Багушэвіча, І.Буйніцкага, І.Луцкевіча, арт. У.Самойлы пра творчасць К.Сваяка, апавяданне В.Адважнага. Інфармавала пра новыя бел. кнігі. Выйшлі 42 нумары. Закрыта польскімі ўладамі. *А.С.Ліс.*

шчытамі. Шчыт на гал. фасадзе аздоблены некалькімі ярусамі розных па форме плоскіх атынкаваных ніш. Знадворку апсіды ў верхняй ч. аб'яднаны ў адну і накрыты агульным высокім дахам. Пазней прыбудаваны бабінец. У 1880—81 у час рамонту заменены дах і дабудаваны купал над апсідай, разабраны купал над цэнтр. ч. храма. Перад царквой пастаўлена бутава-цагляная 2-ярусная 4-гранная званіца, завершаная шатровым дахам. *С.Г.Багласаў.*



Сыктыўкар.

СЫМА́ ГУА́Н (1017 або 1019—1086), кітайскі гісторык. Чл. канфуцыянскай акадэміі «Ханьлінь». Служыў цэнзарам, гістарыёграфам і саветнікам пры імператарскім двары. Аўтар гіст. працы «Цзы чжы тун цзянь» («Усеагульны агляд падзей, якія дапамагаюць кіраванню»), якая ахоплівае перыяд гісторыі Кітая з 403 да н.э. да 959 н.э.; складзена ў супрацоўніцтве з Лю Бінем, Лю Шу і Фань Цзуюем.

СЫМА́ ЦЯНЬ (каля 145 або 135 — каля 86 да н.э.), старажытнакітайскі гісторык. З 108 да н.э. прыдворны гістарыёграф ханьскага двара. Аўтар «Гістарычных нататак» — твора, які ахоплівае гісторыю Кітая са старажытнасці да канца 2 ст. да н.э. У ім упершыню ў кіт. гістарыяграфіі выкарыстаны комплексны прынцып, які спалучаў храналагічны паказ падзей, тэматычнае асвятленне грамадскага жыцця і біяграфіі асоб, што зрабіла працу ўзорам для кіт. гісторыкаў.

Тв.: Рус. пер. — Исторические записки. Т. 1—7. М., 1972—96.

Літ.: Кроль Ю.Л. Сыма Цянь — историк? М., 1970.

«СЫН БЕЛАРУ́СА», заходнебеларуская газета. Выдавалася з 18.5 да 19.9.1924 у Вільні на бел. мове 3 разы на тыдзень. Прадаўжала традыцыі забароненай польскімі ўладамі газ. «*Голас беларуса*». Выкрывала палітыку ўрада Польшчы, скіраваную на дэнацыяналізацыю ўскраін, паліт. ўціск працоўных. Адстойвала інтарэсы нар. мас Зах. Беларусі, выступала супраць польскіх партый і бел. праўрадавых груповак. Друкавала

«СЫН ОТЕ́ЧЕСТВА», рускі гіст., паліт. і літ. часопіс. Выдаваўся ў 1812—44 і 1847—52 у Пецярбургу. Засн. М.*Грэчам*. Перыядычнасць мянялася. У 1829—35 выдаваўся разам з час. Ф.В.Булгарына «Северный архив» пад назвай «Сын отечества и Северный архив». Напачатку друкаваў матэрыялы пра вайну 1812, у т.л. пра падзеі на Беларусі: «Пісьмо Віцебскага інтэнданта да віленскага 14/26 кастрычніка 1812 г.» (1812), «Пісьмо з Віцебска» І.Манькоўскага і «Урывак з запісак віцебскага жыхара» Г.Дабрыніна (1813), «Нешта аб бітве каля Ваўкавыска» (1824) і інш. Да 1825 лічыўся найб. перадавым рус. часопісам, знаходзіўся пад уплывам дзекабрысцкай ідэалогіі, пазней эвалюцыяніраваў да кансерватызму. Матэрыялы пра Беларусь ёсць таксама ў публікацыях «Пінск і яго ваколіцы» Ю.Крашэўскага (пер. з польскай мовы, 1837), «Штодзённыя запіскі рускай падарожніцы ў 1827 і 1828 г.» А.С.Целяпнёвай (1831). У 1839 друкаваў нататкі пра жыццё З.Даленгі-Хадакоўскага. *С.А.Кузняева.*

СЫНКО́ВІЦКАЯ ЦАРКВА́-КРЭ́ПАСЦЬ, помнік абарончага дойлідства ў в. Сынковічы Зэльвенскага р-на Гродзенскай вобл. Пабудавана ў канцы 15 — пач. 16 ст. з цэглы. Мае рысы стылю готыкі. 3-нефавы 4-стаўповы 3-апсідны храм зальнага тыпу (у плане — перакошаны прамавугольнік), фланкіраваны па вуглах 4 баявымі вежамі (з З гранёныя, з У круглыя) з цаглянымі вітымі ўсходамі ўнутры. Па версе сцен праходзіць пояс машыкуляў. Будынак накрыты высокім 2-схільным дахам з вострымі тарцовымі

СЫПНЫ́ ТЫФ, вострая інфекцыйная хвароба чалавека, якая выклікаецца *рыкетсіямі* Правачака. Адносіцца да *трансмісіўных хвароб*; перадаецца пры ўкусах вошай. Бывае ў час стыхійных бедстваў (пераважна ў час вайны). Узбуджальнік цыркулюе ў крыві і пашкоджвае дробныя крывяносныя сасуды скуры, галаўнога мозга і інш. органаў.

Адрозніваюць эпідэмічны С.т. (перадаецца пераносчыкам хваробы) і спарадычны (або хвароба Брыла), калі ў даўно перахварэлага чалавека ў арганізме засталіся рыкетсіі, якія актывізуюцца пад уплывам неспрыяльных умоў. Прыкметы: т-ра цела да 40 °С, нясцерпны галаўны боль, трызненне, пляміста-гемарагічная высыпка на скуры (знікае праз 5—6 дзён). Лячэнне тэрапеўтычнае. *А.А.Астапаў.*

СЫР, старадаўні малочны прадукт. На Беларусі С. найперш называюць выраб, сфармаваны са свежай творожнай масы. Кіслае малако ставяць у печ ці ў гарачую ваду, каб стварожылася. Потым выліваюць у спец. палатняны мяшочак — клінок, падвешваюць, каб сцякла сыроватка, соляць, дадаюць смятаны, перамешваюць і зноў кладуць у клінок паміж дошчачкамі пад камень або пад прэс. С. спажываюць свежым; падсушаны можа захоўвацца доўгі час. Гл. таксама *Сыраробства*. *Г.Ф.Вештарт.*

СЫРАВІ́НА, сырыя матэрыялы, прадмет працы, які патрабуе далейшай перапрацоўкі ў працэсе вытворчасці. Паводле вытв. прызначэння адрозніваюць С. асноўную (з якой атрымліваюць гатовую прадукцыю ці паўфабрыкаты) і дапаможную (дадаецца, каб забяспечыць неабходныя змены ўласцівасцей асноўнай С. ў працэсе яе



Сынковіцкая царква-крэпасць.

перапрацоўкі, напр., вапняк, кварц пры выплаўцы металу. С. падзяляюць на прамысловую і сельскагаспадарчую. Першая бывае мінер. (нафта, вугаль, руды металаў, графіт і інш.) і штучная (сінт. смолы і пластмасы, штучнае валакно, заменнікі скуры і інш.), другая — раслінная (збожжавыя і тэхн. культуры, драўніна, лекавыя расліны і інш.) і жывёльная (мяса, рыба, малако, скуры, воўна і інш.). Паводле вытв. выкарыстання мінер. С. падзяляецца на паліўна-энергетычную (нафта, прыродны газ, гаручыя сланцы, уран і інш.), металургічную (руды металаў і інш.), горнахім. (апатыты, калійныя солі, барыт, сера і інш.), тэхн. (алмазы, графіт, слюда і інш.). У некаторых галінах прамысловую С. падзяляюць таксама на першасную (здабытая руда, цэлюлоза і інш.) і другасную (металалом, макулатура і інш.).

Беларусь мае запасы паліўна-энергетычнай С. (нафта, буры вугаль, торф), нярудных карысных выкапняў (калійныя солі, каменныя солі, буд. і абліцовачны камень, *даламіт*, буд., сілікатны і кварцавы *пясок*, *гіпс*, *мел*, *мергель* і інш.). Шырока выкарыстоўваюцца натрыевыя, радонавыя, сульфатныя, хларыдныя і інш. мінеральныя воды. Вырабляюцца пластычныя масы, сінт. смолы, штучныя валокны, скуры, штучнае футра. З раслінай С. ў рэспубліцы найб. значэнне маюць драўніна, бульба, лён, цукр. буракі, збожжа і інш. Гл. таксама *Прыродныя рэсурсы, Неметалічныя карысныя выкапні*. *Ю.М.Румянцава.*

СЫРАДУ́ТНЫ ПРАЦЭ́С, атрыманне цестападобнага жалеза непасрэдна з руды ў сыradутных горнах або невял. пячах шахтавага тыпу. Спосаб узнік у 2-м тыс. да н.э., існаваў да пач. 20 ст.

Напачатку ажыццяўляўся ў ямах, унутр. абліцоўка (футроўка) якіх рабілася з вогнетрывалай гліны, або ў каменных ачагах з натуральнай цягай (ажыццяўлялася адкрытай фурмой знізу). Загружаная зверху жал. руда ператваралася ў крыцу — цвёрдую губчастую масу жалеза, якую для ўшчыльнення (зварвання) пракоўвалі. Пазней сыradутныя горны (гл. *Горан*) удасканалены выкарыстаннем для футроўкі цэглы ці вогнетрывалага каменя і штучнага дуцця з дапамогай меха. У канцы 19 ст. ўдасканалены С.п. ў спец. пячах стаў бесперапынным. Разнавіднасць С.п. — к р ы ч н а р у д н ы п р а ц э с, якім бедныя цяжкаабагачальныя або комплексныя жал. руды перапрацоўваліся ў крыцу ў вярчальных трубчастых пячах.

СЫРАДЭ́ЛЯ, п т у ш к а н о ж к а (Ornithopus), род кветкавых раслін сям. стручкавых. Каля 10 відаў. Пашыраны пераважна ў тропіках і субтропіках. С. пасяўная (O. sativus) як кармавая расліна, з канца 19 ст. ўведзена ў культуру ў Еўропе, у т.л. на Беларусі.

С. пасяўная — аднагадовая травяністая расліна выш. да 60 см. Сцёблы тонкія, галінастыя. Лісце непарнаперыстае, ланцэтнае. Кветкі дробныя, бледна-ружовыя, сабраныя ў гронкі. Плод — струк, нагадвае нагу птушкі (адсюль другая назва). Зялёная маса С. ідзе на корм і ўгнаенне. Меданосная расліна.

В.М.Прохараў.

СЫРАЕ́Д Тамара Мікалаеўна (н. 13.9.1940, станіца Паўлаўская Краснадарскага краю, Расія), бел. вучоны-эканаміст. Канд. эканам. н. (1972), праф. (1993). Скончыла Маскоўскі каап. ін-т (1968). З 1972 у Бел. гандл.-эканам. ун-це спажывецкай кааперацыі (з 1977 заг. кафедры, з 1994 прарэктар, з 1996 рэктар). Навук. працы па эканоміцы гандлю, праблемах цэнаўтварэння і стымулявання працы.

Тв.: Экономическая работа в системе потребительской кооперации, основные направления ее совершенствования. М., 1985; Актуальные проблемы развития потребительской кооперации в условиях рынка. Гомель, 1995 (у сааўт.); Экономика торговли. Ч. 1—2. Гомель, 1999—2001 (у сааўт.). *Л.В.Міснікова.*



Сырадэля пасяўная.

СЫРАЕ́ЖКА (Russula), род шапкавых базідыяльных грыбоў сям. сыраежкавых. Каля 280 відаў. Пашыраны пераважна ў Еўразіі і Паўн. Амерыцы. На Беларусі больш за 65 відаў. Найб. вядомыя С.: *валуй*, балотная (R. paludosa), жоўтая (R. claroflava), крохкая (R. fragilis), пурпурна-чырвоная (R. obscura), харчовая (R. vesca), падгруздкі белы (R. delica), чорны (R. adusta) і інш. Трапляюцца з ліп. па вер. у лясах розных тыпаў.

Пладовае цела — шапка на ножцы. Шапка напачатку пукатая, потым распасцёртая, часта лейкападобная, з завернутым краем і сухой, гладкай, часам слізістай скуркай. Пласцінкі прырослыя або свабодныя. Ножка цыліндрычная, цэнтр., полая. Мякаць звычайна белая, крохкая, шчыльная, у некат. відаў едкая на смак. Споры акругла-авальныя, шыпаватыя, бясколерныя або жаўтаватыя. Ядомая.

«СЫРАКО́МЛЯ», прыватнаўласніцкі герб, якім карысталіся каля 70 родаў Беларусі, Украіны, Літвы і Польшчы, у т.л. Булгакі, Вайніловічы, Грахольскія, Кандратовічы, Пуцяты. Мае ў чырв. полі сярэбраны знак у выглядзе лац. літары W (як у гербе «*Габданк*»), на ім сярэбраны крыж. Клейнод — над прылбіцай з каронай такі ж знак з крыжам. Вядомы з сярэдзіны 14 ст., у ВКЛ — пасля *Гарадзельскай уніі 1413*.

СЫРАКО́МЛЯ Уладзіслаў (сапр. К а н д р а т о в і ч Людвік; 29.9.1823, в. Смольгава Любанскага р-на Мінскай вобл. — 15.9.1862), польскі і бел. паэт. Гады маленства правёў на Міншчыне ў арандаваных бацькам фальварках Яськавічы (Салігорскі р-н), Кудзінавічы (Капыльскі р-н), Мархачоўшчына (Стаўбцоўскі р-н).



Сыраежка: 1 — сіне-зялёная; 2 — едкая; 3 — харчовая; 4 — балотная.

Вучыўся ў дамініканскіх школах у Нясвіжы (1833—35) і Навагрудку (1836—37). Працаваў у Нясвіжскай канцылярыі кіраўніцтва радзівілаўскімі маёнткамі (1841—44). У 1844—52 арандаваў фальварак Залучча (Стаўбцоўскі р-н), з 1853 — Барэйкаўшчына (каля Вільні). За патрыят. выступленні на антыцарскіх маніфестацыях у 1861 арыштаваны



У.**Сыракомля**.



Я.К.**Сыркін**.

і зняволены ў віленскую турму. Першае выступленне ў друку — вершаваная гутарка «Паштальён» (1844; у скарочаным варыянце ў перакладзе Л.Трэфалева стала папулярнай рус. нар. песняй «Ямшчык»). Творчасць С. цесна звязана з гісторыяй Беларусі, з вераваннямі, звычаямі і вуснай паэзіяй бел. народа; яна глыбока дэмакратычная, антыпрыгонніцкага характару. Паэт апяваў высокую духоўнасць, сумленнасць і дабрыню простага чалавека («Улас», «Споведзь пана Корсака»), маляваў бязрадасныя карціны сял. жыцця («Гуляй, душа!», «Нядзеля», «Непісьменны», «З уражанняў палескага падарожжа», «Грабар»), ганьбаваў прыгнятальнікаў народа («Ілюмінацыя», «Лялька», «Дзічына», «Эпітафія землеўласніку»), абураўся іх абыякавасцю да лёсу прыгонных («Вызваленне сялян»), выступаў супраць самадзяржаўя («Самуэлю Неслухоўскаму», «Мазурка», «Сахар-мароз»), разам з тым прытрымліваўся ідэй класавага салідарызму. Сувязь яго твораў з бел. фальклорам выяўлялася ў перакладах і апрацоўках нар. песень («Народная песенька з ваколіц Вільні», «Доля», «Груган», «Жніўная песня»), запазычанні матываў і сюжэтаў («Хадыка», «Пра зачараваны скарб») і інш. Стварыў вершаваную гутарку, дзе стылістычна свабодна з прыкметамі імправізацыі апавядалася пра павучальную жыццёвую гісторыю паводле нар. уяўленняў пра дабро і зло. Як праніклівы фальклярыст і знаўца вуснай паэзіі беларусаў С. раскрыўся ў рэцэнзіі на кнігу А.Глінскага «Польскі казачнік» (1853) і ў «Кароткім даследаванні мовы і характару паэзіі русінаў Мінскай правінцыі» (1856). Вывучэнню Беларусі прысвяціў гісторыка-краязнаўчыя працы «Вандроўкі па маіх былых ваколіцах» (1853), «Мінск» (1857), «Нёман ад вытокаў да вусця» (1861) і інш. Падтрымліваў сувязь з мінскім літ. асяроддзем, выступаў у польскім друку з водгукамі пра бел. творы В.Дуніна-Марцінкевіча (1855, 1857, 1861), дзе выказаў зацікаўленасць перспектывамі развіцця бел. л-ры і мовы, напісаў у гонар бел. паэта верш «Тост у доме В.Марцінкевіча». Прыхільнік пачынанняў А.Вярыгі-Дарэўскага, скіраваных на ўмацаванне кантактаў паміж літаратарамі і культ. дзеячамі Беларусі («Альбом» Вярыгі-Дарэўскага адкрываецца запісам С.). Падтрымаў прыход у л-ру В.Каратынскага, разам з якім збіраўся выдаць кнігу вершаў на бел. мове (задума не ажыццёўлена). З бел. твораў С. зберагліся агітацыйны антыцарскі верш «Добрыя весці» (нап. 1848—61, апубл. 1862) і вершаваная лірычная мініяцюра «Ужо птушкі пяюць усюды...» (нап. 1861), дзе закраналіся новыя для бел. л-ры тэмы і паняцці, выкарыстоўваліся не асвоеныя яшчэ бел. аўтарамі маст. сродкі. Творчасць С., сугучная праблемам роднага краю ў перыяд разгортвання нац.-вызв. руху, прыкметна паўплывала на фарміраванне бел. л-ры новага часу. На бел. мову яго творы перакладалі А.Абуховіч, Я.Лучына, Я.Купала, А.Паўловіч, Г.Леўчык, М.Машара, У.Дубоўка, М.Лужанін, К.Цвірка, К.Паўтаржыцкі, У.Мархель, Х.Лялько і інш. Вобраз С. выведзены ў аповесці А.Мальдзіса «Восень пасярод вясны» (1984).

Тв.: Poezje Ludwika Kondratowicza. T. 1—10. Warszawa, 1872; Бел. пер. — Выбр. творы. Мн., 1966; Вандроўкі па маіх былых ваколіцах. Мн., 1992; Мінск. Мн., 1992; Добрыя весці. Мн., 1993; Згадкі Нясвіжа: Санеты. Мн., 2002.

Літ.: Цвірка К. Слова пра Сыракомлю. Мн., 1975; Мархель У. Лірнік вясковы. Мн., 1983; Яго ж. Вяшчун славы і волі. Мн., 1989; Fornalczyk F. Hardy limik wioskowy. Poznań, 1972; Romankówna M. Władysław Syrokomla, życie i twórczość. Kraków, 1975. *У.І.Мархель.*

СЫРАРО́БСТВА, выраб *сыроў* з малака с.-г. жывёл. Працэс вытв-сці заснаваны на згусанні малака з дапамогай сычужнага ферменту або малочнай к-ты і ўключае падрыхтоўку малака да згусання (нармалізацыю, пастэрызацыю, унясенне бактэрыяльных заквасак), ператварэнне яго ў шчыльны згустак, выдаленне залішняй сыроваткі, фармаванне, прасаванне ў галоўкі, саленне і вытрымку для выспявання.

Сычужныя сыры атрымліваюць сквашваннем малака пад уздзеяннем сычужных ферментаў, кісламалочныя — малочнай к-ты. Цвёрдыя сыры (галандскі, расійскі і інш.) пасля салення вытрымліваюць пэўны час для выспявання і набыцця характэрнага смаку, водару, кансістэнцыі і колеру; мяккія (ракфор і інш.) выспяваюць пры уздзеянні паверхневай мікрафлоры і цвілі; расольныя (брынза, чанах, сулугуні і інш.) — у расоле, таму не маюць скарынкі і адрозніваюцца вострасалёным смакам. Плаўленыя сыры атрымліваюць пераплаўленнем натуральных сыроў з выкарыстаннем розных (адпаведных кожнаму віду сыру) рэцэптур. Гатовы сыр звычайна пакрыты парафінам, палімернымі плёнкамі, эмульсіямі, этыкетнай паперай. У С. выкарыстоўваюць механізаваныя сыраробныя ванны, фармовачныя апараты, машыны для апрацоўкі парафінам і інш.

С. было развіта ў Стараж. Грэцыі і Рыме, у сярэднія вякі асн. раёнам С. лічылася даліна р. По (Італія). У Францыі рабілі пераважна мяккія сыры (камамбер, ракфор, бры), у Швейцарыі — швейцарскія (эментальскія), у Галандыі — галандскі (эдамскі). Прамысл. развіццё ў Еўропе і Амерыцы С. атрымала ў 19 ст., у Расіі — у 2-й пал. 19 ст. На Беларусі сыраварні вядомы з 16 ст. У свеце выпрабляецца каля 700 відаў сыроў (у краінах СНД больш як 160). Гл. таксама *Масласыраробная і малочная прамысловасць*.

Літ.: Диланян З.Х. Сыроделие. 3 изд. М., 1984. *К.В.Фамічэнка.*

СЫ́РДАР'Я (стараж. Яксарт), рака ў Таджыкістане, Узбекістане і Казахстане, вытокі ў Кіргізіі. Утвараецца ад сутокаў рэк Нарын і Карадар'я. Даўж. 2212 км (ад вытоку р. Нарын 3019 км), пл. бас. 219 тыс. км^2. Бас. рэк Нарын і Карадар'я ў гарах Цянь-Шаня. Верхняе цячэнне С. ў межах Ферганскай даліны ў нізкіх берагах, пры выхадзе з даліны прарэзвае Фархадскія горы, утварае Бегавацкія парогі. Ніжняе цячэнне па ўсх. ускраіне пустыні Кызылкум (рэчышча прыўзнята над навакольнай мясцовасцю, звілістае і няўстойлівае). Раней С. ўпадала ў Аральскае м., у вусці ўтварала невял. дэльту; цяпер воды ракі поўнасцю разбіраюцца на гасп. патрэбы. Асн. прытокі: Чырчык, Арысь (справа). Найб. воднасць у сярэднім цячэнні, каля чыг. ст. Цюмень-Арык (996 км ад вусця) сярэдні расход вады 618 м^3/с. Вясенне-летняе разводдзе. С. нясе шмат наносаў (да 10—12 млн. т за год), вада мутная. Рыбалоўства. Суднаходная на асобных участках ад г. Бекабад. У даліне С. густая сетка арашальных каналаў. Кайраккумская, Фархадская, Чардарынская ГЭС і вадасховішчы, Кзыл-Ардзінская плаціна. Каля Чардарынскага вадасх. саланаватае воз. Айдаркуль. На С. — гарады Худжанд (Таджыкістан), Бекабад (Узбекістан), Чардара, Кзыл-Арда, Казалінск (Казахстан).

СЫ́РКІН Якаў Ківавіч (5.12.1894, Мінск — 8.1.1974), савецкі фізікахімік. Акад. АН СССР (1964, чл.-кар. 1943). Скончыў Іванава-Вазнясенскі політэхн. ін-т (1919), дзе і працаваў (з 1925 праф., заг. кафедры). У 1931—74 заг. кафедры Маскоўскага ін-та тонкай хім. тэхналогіі. З 1967 заг. аддзела Ін-та агульнай і неарган. хіміі АН СССР. Навук. працы па хім. тэрмадынаміцы і кінетыцы, квантавай хіміі арган. і неарган. злучэнняў, эксперым. даследаванні будовы малекул. Даў тлумачэнне электроннай будовы малых цыклаў (разам з М.Я.Дзяткінай). Дзярж. прэмія СССР 1943.

Тв.: Химическая связь и строение молекул. М.; Л., 1946 (разам з М.Я.Дзяткінай).

Літ.: Я.К.Сыркин. М., 1971.

СЫ́РКУС (Syrkus) Шыман (24.4.1893, Варшава — 8.6.1964), польскі архітэктар і тэарэтык архітэктуры; адзін са стваральнікаў польскай арх. школы 20 ст. Вучыўся ў АМ у Кракаве (1918—21), Школе прыгожых мастацтваў у Парыжы (1922—24). Скончыў політэхн. ін-т у Варшаве (1922), выкладаў у ім (з 1949 праф.). Адзін з заснавальнікаў і тэарэ-

тык аб'яднання архітэктараў «Прэзенс» (з 1926). Працаваў разам з жонкай Геленай С. У 1920—30-я г. будаваў асабнякі ў духу функцыяналізму (віла ў Саснаўцы, каля г. Пінск Брэсцкай вобл., 1933—34). У 1940—60-я г. вёў работу па уніфікацыі тыпавога жыллёвага буд-ва (забудова раёна Кола ў Варшаве, 1947—62). Аўтар публікацыі «Варшава функцыяналістычная» (1934, з Я.Хмялеўскім).

СЫ́РНІЦА, гаспадарчая пабудова для сушкі і захоўвання сыру. Лакальныя назвы сырнік, сырня. Былі пашыраны на Беларусі, у Літве, Польшчы пераважна ў сядзібах і фальварках 16 — пач. 20 ст. У канцы 19 ст. з'явіліся і ў некат. сял. гаспадарках, якія наладзілі вытв-сць сыроў на продаж. На Беларусі найчасцей С. рабілі драўлянымі, абавязкова 2-яруснымі. 1-ы паверх мог заставацца адкрытым, на слупах (1—12; вёскі Рудня Астравецкага,Сваятычы Ляхавіцкага р-наў), або мець памяшканне для захоўвання малочных прадуктаў (в. Боркі Дзятлаўскага р-на). Каркасная канструкцыя 2-га паверха з дошак, жэрдак, плятня дапамагала ствараць неабходныя ўмовы для добрай вентыляцыі і сушкі сыроў. Характэрны элемент С. — галерэя на 2-м паверсе, дзе пад страхой сушылі сыры (б. маёнтак Залучча, Стаўбцоўскі р-н). Галерэю рабілі на выпусках бэлек ці на слупах. Квадратны план, ярусная аб'ёмна-прасторавая кампазіцыя, шатровы гонтавы дах, кругавая галерэя, выразны сілуэт рабілі С. адной з цікавых пабудоў сядзібы. Ставілі С. паблізу сядзібнага дома ці ў парку. Захавалася С. 19 ст. мяшанай канструкцыі (мураваны ніжні паверх) у парку б. сядзібы ў в. Сітцы Докшыцкага р-на.

Літ.: Сергачоў С. Сырніцы // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1985. №4.

С.А.Сергачоў.



Сырніца ў былым маёнтку Залучча Стаўбцоўскага раёна Мінскай вобл. Фрагмент гравюры А.Савіцкага. 1873.



Сырніца ў вёсцы Боркі Дзятлаўскага раёна Гродзенскай вобл. Пач. 19 ст.

СЫ́РНІЦА, у беларусаў тварожная маса, якую збіралі працяглы час і складвалі для захоўвання. Падобная да *брынзы*. Тварог насуха адціскалі і шчыльна складвалі ў дзежку, залівалі маслам; праз некаторы час дадавалі слой новага тварагу і слой масла і г.д. Звычайна С. рабілі пасля ацёлу кароў у час посту, калі малако было, але яго забаранялася есці. Спажывалі С. звычайна разагрэтай. Вядома на Міншчыне, Вілейшчыне, Віцебшчыне. *Г.Ф.Вештарт.*

СЫРО́Д, вёска ў Калінкавіцкім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 8 км на ПдУ ад горада і чыг. ст. Калінкавічы, 120 км ад Гомеля. 643 ж., 231 двор (2002). Акц. т-ва «Бытсервіс». Базавая школа, Дом маст. самадзейнасці, б-ка, аддз. сувязі.

СЫРО́К, рыба сям. ласасёвых, гл. *Пелядзь*.

СЫ́РТЫ (ад цюрк. сырт — узвышша), выцягнутыя шырокія ўзвышшы (выш. 300—500 м), парэзаныя неглыбокімі лагчынамі і ярамі і ўкрытыя стэпавай расліннасцю, у Заволжы і Паўд. Перадураллі, у Расіі; роўныя або пакатахвалістыя слабарасчлянёныя дэнудацыйныя раўніны, узнятыя навейшымі рухамі на выш. 3000—4000 м і падзеленыя больш высокімі хрыбтамі на Цянь-Шані і Усх. Паміры.

СЫРЦЬ, рыба сям. карпавых, гл. *Рыбец*.

СЫС Анатоль Ціханавіч (н. 26.10.1959, в. Гарошкаў Рэчыцкага р-на Гомельскай вобл.), бел. паэт. Скончыў Гомельскі ун-т (1982). Друкуецца з 1974. У паэт. зб-ках «Агмень» (1988), «Пан Лес» (1989), «Сыс» (2002) зварот да гісторыі, роздум над лёсам радзімы, тэмы паэта і паэзіі, дзяцінства. Паэзіі С. ўласцівы грамадзянскасць, міфалагічнасць, шчырасць. Аўтар паэм «Алаіза» і «Агоньптушка» (абедзве 1988), эсэ.

СЫСО́ЕЎ Георгій Васілевіч (н. 17.10.1919, г. Волагда, Расія), бел. архітэктар. Засл. архітэктар Беларусі (1973). Чл.-кар. Пятроўскай акадэміі навук і мастацтва ў Пецярбургу (1994). Скончыў Ленінградскі ін-т жывапісу, скульптуры і архітэктуры імя І.Я.Рэпіна (1949). Працаваў у ін-тах «Белдзяржпраект» (1952—60), «Белдзіпрагандаль» (1966—71), «Мінскпраект» (1960—66 і 1971—90). У 1952—64 выкладаў у Мінскім маст. вучылішчы і Бел. тэатр.-маст. ін-це. У 1990—94 кіраваў персанальнай творчай майстэрняй пры Бел. саюзе архітэктараў. Гал. работы ў Мінску: праект планіроўкі і забудовы 2-й чаргі праспекта Скарыны (жылыя дамы з магазінамі «1000 дробязей», «Кветкі», «Сілуэт», «Сінтэтыка», «Дом абутку», «Акадэмкніга» і інш., усе



Г.В.**Сысоеў**.

1955—64), магазін «Тэхніка ў побыце» на Юбілейнай пл. (1965), 11-павярховыя дамы на бульвары Луначарскага (1965—72), гасцініца «Мінск» (2-я чарга, 1969), будынак гар. Савета нар. дэпутатаў (1964; усе ў сааўт.) і інш. Адзін з аўтараў мемар. комплексу *Брэсцкая крэпасць-герой*, помніка-бюста С.І.Грыцаўцу ў Мінску (скульпт. З.Азгур, 1956), помніка К.С.Заслонаву ў г. Орша Віцебскай вобл. (скульпт. С.Селіханаў, 1955). Кіраваў рэканструкцыяй інтэр'ера Дома афіцэраў у Мінску (1974). Дзярж. прэмія Беларусі 1968. *І.Л.Чэбан.*

СЫСО́ЕЎ Павел Васілевіч (н. 10.8.1930, хутар Прылесны Цалінскага р-на Растоўскай вобл., Расія), бел. вучоны ў галіне матэрыялазнаўства. Д-р тэхн. н. (1981), праф. (1986). Скончыў Растоўскі ін-т інжынераў чыг. транспарту (1955). З 1965 у Ін-це механікі металапалімерных сістэм Нац. АН Беларусі (да 1995 заг. аддзела). Навук. працы па стварэнні металапалімерных матэрыялаў з высокім супрашўленнем фрыкцыйнай стомленасці. Прапанаваў новыя метады атрымання кампазіцыйных матэрыялаў для вузлоў трэння машын і механізмаў. Дзярж. прэмія Беларусі 1980.

Тв.: Новые композиционные материалы на основе промышленных отходов химических волокон. Мн., 1984 (у сааўт.); Деформация и износ полимеров при трении. Мн., 1985 (разам з П.М.Багдановічам, А.Дз.Лізаравым); Фрикционные композиты на основе полимеров. Мн., 1992 (у сааўт.).

СЫСУНЫ́, клас пазваночных жывёл, гл. *Млекакормячыя*.

СЫСУ́ЧЫЯ ІНФУЗО́РЫІ, сукторы і (Suctoria) клас прасцейшых тыпу інфузорый. Каля 500 відаў. Пашыраны ў прэсных вадаёмах і морах. На Беларусі найб. адзначаюцца такафрыі квадрыпартыта (Tocophrya quadripartita) і цыклопавая (T. cyclopum), ацынета вялікая (Acineta grandis), падофрыя прымацава-

ная (Podophria fixa). Пераважна сядзячыя формы.

Даўж. ад 30 мкм да 3 мм. Раснічкі ў дарослых адсутнічаюць. Могуць прымацоўвацца да субстрату, водных раслін і жывёл. У некат. цела моцна разгалінаванае. Рот адсутнічае. З дапамогай хапальных і сысучых шчупальцаў ловяць і высмоктваюць здабычу, пераважна *інфузорый* (адсюль назва). Размнажэнне бясполае (вонкавае або ўнутр. пачкаванне, пры якім утвараюцца плаваючыя або поўзаючыя «бадзяжкі») і палавое — кан'югацыя. Некат. — паразіты інш. інфузорый.

СЫТА́, у многіх народаў засалоджаная мёдам вада. Спажывалі С. як посную закрасу да кашы, куцці, кісялю, асабліва на Каляды. На памінкі, дзяды гатавалі абрадавую страву — *канун* (у С. крышылі хлеб). Самастойна С. спажывалі ў дні посту. Вядома па ўсёй Беларусі. Пчаляры выкарыстоўвалі С. для падкормкі пчол і прываблівання раёў у пустыя вуллі і вабікі. Рабілі С. вадкую і густую. Вадкая змяшчала адну частку мёду і 2—3 часткі вады; яе выкарыстоўвалі вясной і раннім летам для стымуляцыі яйканоскасці матак і павелічэння расплоду. С. гатавалі і з 2—3 частак мёду і адной часткі вады, яе выкарыстоўвалі для веснавой падкормкі пчол пры недахопе ў вуллі мёду пасля зімы.

Г.Ф.Вештарт, С.Ф.Цярохін.

СЫ́ТЧАНКА Уладзімір Іванавіч (н. 5.8.1951, г. Маладзечна Мінскай вобл.), бел. мастак, графік. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1975). У 1979—83 на Мінскім маст.-вытв. камбінаце. Працуе ў галіне станковай і кніжнай графікі, плаката і жывапісу, у тэхніках пастэлі і акварэлі. Для яго працы характэрны



Сысучыя інфузорыі: 1 — такафрыя квадрыпартыта; 2 — эфелота гемінара; 3 — такафрыя цыклопавая; 4 — дэндрасома радыяльная.

дасканалая кампазіцыйная пабудова, выразная тэхніка выканання, лірызм і рамантычнасць. Сярод твораў: серыі лінарытаў «Скульптары і графікі» (1975), «Мінск сучасны» (1984); гравюры «Нацюрморт з люстэркам», «Нядзелька» (абедзве 1980), «Аўтапартрэт» (1983); акварэлі «Надзея» (1978), «Аўтапартрэт», «Нацюрморт з лялькаю» (абедзве 1979), «Вясковы дворык» (1996); пастэлі «Партрэт дзяўчыны» (1976), «Нацюрморт» (1981); плакаты. Афарміў зб. бел. нар. песень «Купалінка» (1986), зб. вершаў «Мы — беларусы» (1988); кнігі «Лістапад на пачатку лета» І.Стадольніка, «Дыялог» А.Дударава (абедзве 1987), «У тумане» В.Быкава (1989), «Голас крыві брата твайго» В.Адамчыка (1991), «Хлопчык глядзіць» А.Вярцінскага (1992) і інш.

І.Л.Чэбан.



У.**Сытчанка**. Роздум. З серыі «Скульптары і графікі». 1975.



Сыць круглая.

СЫ́ТЫ Уладзімір Пятровіч (н. 5.3.1943, в. Бандары Гродзенскага р-на), бел. вучоны ў галіне кардыялогіі. Д-р мед. н., праф. (1993). Скончыў Гродзенскі мед. ін-т (1966). З 1980 у Бел. акадэміі паслядыпломнай адукацыі (з 1996 заг. кафедры). У 1990—99 гал. тэрапеўт Мін-ва аховы здароўя Беларусі. Навук. працы па тэрапіі ішэмічнай хваробы сэрца з дапамогай ультрагуку, вывучэнні этыяпатагенезу, клінікі лячэння захворванняў, асацыіраваных з узростам.

Тв.: Изменение состояния гипофизарно-тиреоидной системы, уровня предсердного натрийуретического фактора, циклических нуклеотидов в крови у больных ИБС под воздействием ультразвукового облучения прекардиальной области (разам з А.Г.Мрочакам, Э.У.Рудэнка) // Кардиология. 1992. №7/8; Практическое пособие по терапии. Мн., 2001 (разам з І.І.Ганчарыкам).

СЫ́ЦІН Іван Дзмітрыевіч (5.2.1851, с. Гнезднікава Кастрамской вобл., Расія — 28.11.1934), рускі выдавец-асветнік. У 1876 адкрыў у Маскве літаграфічную майстэрню. У 1883 арганізаваў выдавецкае т-ва «І.Дз.Сыцін і К°». У 1890-я г. арганізаваў выданне серыі нар. кніжак «Праўда». Выд-ва С. выпускала падручнікі і вучэбныя дапаможнікі (пераважна для пачатковай школы), кнігі па педагогіцы, навук.-папулярныя серыі («Бібліятэка для самаадукацыі», «Народная энцыклапедыя навуковых і прыкладных ведаў», т. 1—14), дзіцячую л-ру (у т.л. «Дзіцячую энцыклапедыю», т. 1—10), нар. календары, рэліг. л-ру, масавыя выданні зборaў твораў А.Пушкіна, М.Гогаля, Л.Талстога, А.Чэхава і інш. Значнае месца займалі шматтомныя выданні: «Айчынная вайна і рускае грамадства, 1812—1912» (т. 1—7, 1911—12), «Ваенная энцыклапедыя» (т. 1—18, 1911—15). Выдаваў таксама час. «Вокруг света» (1891—1917), «Искры» (1901—1916), газ. «Русское слово» (1897—1917) і інш. Да 1914 выд-ва выпускала чвэрць кніжнай прадукцыі Расіі. Пасля 1917 яго друкарні нацыяналізаваны. С. лічыўся кансультантам Дзяржвыда Расіі.

Тв.: Жизнь для книги. М., 1960.

Літ.: Коничев К.И. Русский самородок. 2 изд. Ярославль 1969; Белов С.В., Толстяков А.П. Русские издатели конца XIX — начала XX в. Л., 1976.

СЫЦЬ (Cyperus), род кветкавых раслін сям. асаковых. Каля 300 відаў. Пашыраны ў трапічных, субтрапічных, радзей умераных паясах. На Беларусі 1 від — С. бурая (C. fuscus). Трапляецца на вільготных лугах, водмелях і па берагах рэк. У культуры *папірус* (Стараж. Егіпет), *чуфа*, або С. ядомая, у аранжарэях і пакоях вырошчваюць С. чарговалістую (C. alternifolius) — цыперус.

Шматгадовыя, радзей двух- або аднагадовыя карэнішчавыя травы. Сцёблы прамастойныя. Лісце лінейнае, прыкаранёвае, часам рэдукаванае. Кветкі двухполыя, у каласках, сабраныя у парасонападобнае або галоўчатае суквецце. Плод — арэшак. Харч., тэхн., дэкар. расліны, некат. пустазелле.

А.М.Скуратовіч.

СЫЦЬКО́ Уладзімір Уладзіміравіч (н. 11.10.1951, г. Гродна), бел. фізік. Д-р фіз.-матэм. н. (1997), праф. (2000). Скончыў Гомельскі ун-т (1974), дзе і працуе з 1978. У 1974—76 у БДУ. Навук. працы па фатоніцы злучэнняў урану і рэдказямельных элементаў, стварэнні люмінафораў і актыўных матэрыялаў для оптаэлектронных прылад, метралагічным забеспячэнні вымяральных прылад аптычнага кантролю. Атрымаў новыя люмінесцэнтныя матэрыялы з высокай канцэнтрацыяй актыўных іонаў.

Тв.: Теоретическая метрология: В 2 ч. Ч. 1. Мн., 1998; Фотоника соединений шестивалентного урана. Гомель, 2000 (разам з Дз.С.Умрэйкам).

СЫ́ЧКАВА, вёска ў Бабруйскім р-не Магілёўскай вобл., на скрыжаванні аўтадарог на Мінск, Бабруйск, Ялізава. Цэнтр сельсавета. За 9 км на ПнЗ ад г. Бабруйск, 119 км ад Магілёва, 4 км ад чыг. ст. Мірадзіна. 432 ж., 222 двары (2002). Базавая школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў. Помнік на месцы подзвігу М.Р.Селязнёва. Мемарыяльны комплекс у гонар 1-га Бел. фронту і партызан.

СЫЧКО́Ў Цярэнцій Яфрэмавіч (н. 6.1.1922, в. Хутар Быхаўскага р-на Магілёўскай вобл.), Герой Сав. Саюза (1944). Скончыў Барысаўскае ваенна-інж. вучылішча (1941), Ваен. акадэмію імя Фрунзе (1952). У Чырв. Арміі з 1940. У Вял. Айч. вайну з 1942 на 1-Паўн.-Каўказскім, Варонежскім, 1-м і 2-м Укр., 1-м і 2-м Бел. франтах. Інж. рота на чале са старшым лейтэнантам С. вызначылася ў вер. 1943 пры фарсіраванні Дняпра ў Чаркаскай вобл. (Украіна), дзе на дэсантных лодках пераправіла цераз раку каля 9 тыс. байцоў, 6 тыс. мін, 398 т боепрыпасаў і інш. грузаў, вывезла 430 параненых. Да 1972 у Сав. Арміі, потым на вытворчасці.

СЫЧО́ВА Ала Васілеўна (н. 28.10.1928, С.-Пецярбург), бел. архітэктар, педагог. Д-р архітэктуры (1983), праф. (1985). Скончыла Уральскі політэхн. ін-т у г. Свярдлоўск (1956). Працавала ў ін-це «Белдзяржпраект» (1958—61). З 1964 выкладае ў Бел. нац. тэхн. ун-це. Працуе ў галіне горадабудаўніцтва, ландшафтнай архітэктуры. Найб. значныя праектныя работы: схема планіроўкі зон адпачынку на воз. Нарач і вадасховішчы Пліч (Мінскі р-н, 1959), парк у г. Беразіно (Мінская вобл., 1979; усе ў сааўт.) і інш. Аўтар больш за 170 навук. прац, навучальных дапаможнікаў. Дзярж. прэмія Беларусі 2000.

Тв.: Загородный отдых детей. М., 1971; Охрана природы и архитектура. Мн., 1976; Ландшафтный облик белорусского села. Мн., 1982; Архитектурно-ландшафтная среда: Вопр. охраны и формирования. 2 изд. Мн., 1982; Ландшафтный дизайн. Мн., 1984 (разам з Н.П.Цітовай); Градостроительство Белоруссии. Мн., 1988 (у сааўт.); Градостроительство и территориальная планировка: Понятийно-терминол. словарь. Мн., 1999 (у сааўт.); Ландшафтная архитектура. Мн., 2002.



Ц.Я.**Сычкоў**.



А.В.**Сычова**.

СЫЧУА́НЬ, правінцыя на ПдЗ Кітая, у бас. верхняга цячэння р. Янцзы. Пл. 570 тыс. км². Нас. каля 110 млн. чал. (2000). Адм. цэнтр г. *Чэнду*. Усх. яе ч. — узгорыстая *Сычуаньская катлавіна*, акаймаваная гарамі; на З — ч. Тыбецкага нагор'я выш. да 7590 м (г. Гунгашань). Клімат субтрапічны мусонны, вільготны. Рэкі (Янцзы і яе прытокі) многаводныя, багатыя гідраэнергіяй. Асн. земляробчы раён — *Сычуаньская катлавіна*.

Гал. збожжавая культура — рыс. Вырошчваюць кукурузу, пшаніцу, ячмень, бабовыя, батат, рапс, цукр. трыснёг, чай, бавоўнік, тунг, цытрусавыя. Шаўкаводства. Гадуюць на З якаў, авечак, коз, на У буйвалаў, свіней. Здабыча нафты, каменнай солі, каменнага вугалю, жал. руды, азбесту і інш. Прам-сць: маш.-буд., хім., баваўняная, харчовая; чорная і каляровая металургія. Асн. прамысл. цэнтры: *Чунцын*, Чэнду, *Цзыгун*. Транспарт чыг. і рачны.

СЫЧУА́ньСКАЯ КАТЛАВІ́НА, Чырвоны басейн, міжгорная ўпадзіна ў Кітаі, у бас. сярэдняга цячэння р. Янцзы. Пл. каля 200 тыс. км². Выш. 400—500 м (на ўскраінах да 1000 м). Абмежавана на З Сіна-Тыбецкімі гарамі, на Пн і ПнУ хр. Цыньлін і Дабашань, на Пд нагор'ем Гуйчжоў. Прымеркавана да сінеклізы Кіт.-Карэйскай платформы. Запоўнена магутнай тоўшчай (да 4000 м) чырванаколерных пясчанікаў і сланцаў юрскага і мелавога ўзросту і інш. асадкавымі пародамі. Утварае прыступкавы амфітэатр, звернуты на Пд. Паверхня ўзгорыстая, перасечана р. Янцзы і яе прытокамі. Клімат субтрапічны вільготны. Сярэдняя т-ра студз. 10 °С, ліп. 29 °С. Ападкаў 800—1750 мм за год. Вегетац. перыяд круглы год. Глебы — жаўтазёмы, чырваназемы. Лістападныя і вечназялёныя лясы (большасць высечана), вышэй за 600 м вільготныя лясы (вечназялёны дуб, вастраліст, лаўр, кунінгамія, кіпарыс, хвоя і інш.). Важны с.-г. раён (вырошчваюць рыс, пшаніцу, кукурузу, чай, тытунь, цытрусавыя і інш. культуры). Класічная правінцыя тэрасавай гаспадаркі. Радовішчы нафты, газу, кам. солі, кам. вугалю, жал. і поліметал. руд. Буйныя гарады *Чунцын* і Чэнду.

СЫЧУ́Г, апошні (чацвёрты) аддзел шматкамернага *страўніка* жвачных жывёл, які адпавядае простаму аднакамернаму страўніку большасці млекакормячых. Злучаецца з *кніжкай* і дванаццаціперснай кішкай. Слізістая абалонка С. пакрыта прызматычным эпітэліем, мае фундальныя, піларычныя і кардыяльныя залозы і ўтварае 13—14 доўгіх складак. Корм у С. ператраўляецца *страўнікавым сокам*. У маладых жывёл выпрацоўваецца *сычужны фермент*.

СЫЧУ́ЖНЫ ФЕРМЕ́НТ, хімазін, рэнін, пратэалітычны фермент, які ўтрымліваецца ў слізістай абалонцы і ў соку *сычуга* маладых жвачных жывёл. Выклікае выпадзенне казеіну малака ў асадак. Просты глабулярны бялок, мал. м. 40 тыс. Аптымальная дзейнасць пры т-ры 40—41 °С і pH 6—6,4. Выкарыстоўваецца ў вытв-сці сыру. У дарослых жывёл выпрацоўка С.ф. спыняецца і ў сычугу ўтвараецца *пепсін*.



Сычы: 1 — касманогі; 2 — вераб'іны; 3 — дамавы.

СЫЧЫ́, начныя драпежныя птушкі сям. сапраўдных соў атр. совападобных. 5 родаў, 25 відаў. Пашыраны ў Еўразіі, Амерыцы, Афрыцы. Аселыя і вандроўныя птушкі. Жывуць у лясах. Гняздуюцца ў дуплах, пабудовах. На Беларусі 3 віды: С. дамавы (Athene noctua) — бел. назва сіпель; касманогі (Aegolius

funereus) і сычык вераб'іны (Glaucidium passerinum), занесеныя ў Чырв. кнігу.

Даўж. да 29 см, маса да 190 г. Самкі буйнейшыя за самцоў. Апярэнне зверху бурае са светлымі плямкамі, на брушку белаватае з цёмнымі стракацінкамі. Крылы кароткія, закругленыя. Кормяцца пераважна мышападобнымі грызунамі, дробнымі птушкамі. Манагамы. Адкладваюць 3—7 яец. *Э.Р.Самусенка.*



П.Ф.**Сычэнка**.

СЫ́ЧЫК Васіль Андрэевіч (н. 14.6.1937, в. Здзітава Бярозаўскага р-на Брэсцкай вобл.), бел. вучоны ў галіне радыётэхнікі і электронікі. Д-р тэхн. н. (1994), праф. (1996). Скончыў Адэскі політэхн. ін-т (1963). З 1970 у Ін-це цепла- і масаабмену АН Беларусі, Мінскім радыётэхн. ін-це, СКБ ВА «Гарызонт». З 1978 у Бел. нац. тэхн. ун-це. Навук. працы па электраэнергетыцы, радыётэхніцы, мікраэлектроніцы. Распрацаваў метады і сродкі фарміравання элементаў мікраэлектронікі, метады неразбуральнага кантролю матэрыялаў і вырабаў, пераўтваральнікі сонечнай энергіі, электрэтныя крыніцы току і інш. прылады, прапанаваў новыя тыпы лятальных апаратаў.

Тв.: Новые типы преобразователей электрических полей. Мн., 1987 (у сааўт.); Измерительные преобразователи излучений на основе полупроводниковых приборных структур. Мн., 1991. *М.П.Савік.*

СЫЧЭ́НКА Пётр Фёдаравіч (19.6.1911, в. Новае Заазер'е Талачынскага р-на Віцебскай вобл. — 25.6.1969), Герой Сав. Саюза (1943). Скончыў Ваенна-авіяц. школу тэхнікаў (1932), Энгельскае ваен. авіявучылішча (1939), курсы ўдасканалення каманднага саставу пры Ваенна-паветр. акадэміі (1945). У Чырв. Арміі з 1931. У Вял. Айч. вайну з 1941 на Цэнтр., Паўд., Бранскім, Варонежскім, Паўд.-Зах., Сталінградскім, 1-м Укр. франтах, удзельнік бітваў пад Масквой, Сталінградам, Курскам. Камандзір штурмавой эскадрыллі капітан С. да студз. 1942 зрабіў 42 баявыя вылеты, прычыніў значныя страты праціўніку ў тэхніцы і жывой сіле. Да 1956 у Сав. Арміі.

СЬЕНФУЭ́ГАС (Cienfuegos), горад у цэнтр. ч. Кубы. Адм. ц. аднайменнай правінцыі. Засн. ў 1819. Каля 130 тыс. ж. (2001). Вузел чыгунак і аўтадарог. Порт (вываз цукру). Прам-сць: харч. (плодакансервавая, перапрацоўка кавы і інш.), тытунёвая, тэкст., гарбарна-абутковая, хім. (з-д азотных угнаенняў). Цэнтр рыбалоўства. Турызм. У наваколлі ў г. Хагуа АЭС (першая на Кубе). Арх. помнікі 19 ст.

СЬЕНФУЭ́ГАС ГАРЫЯРА́Н (Cienfuegos Gorriarán) Каміла (6.2.1932, Гавана — 28.10.1959), кубінскі рэвалюцыянер. Вучыўся ў Акадэміі мастацтваў у Гаване. З 1954 удзельнік студэнцкага руху супраць дыктатуры Ф.Батысты-і-Сальдывара. У 1956 эмігрыраваў у Мексіку, дзе далучыўся да групы Ф.*Кастра Рус*, удзельнічаў у яе высадцы на У Кубы ў снеж. 1956. Адзін з камандзіраў паўстанцкай арміі, са жн. 1958 камандуючы паўстанцкай 2-й калонай, якая сумесна з атрадамі Э.*Гевары дэ ла Серны* ў студз. 1959 авалодала Гаванай (гл. *Кубінская рэвалюцыя 1959*). Са студз. 1959 камандуючы Рэв. ўзбр. сіламі прав. Гавана, потым — нач. Гал. штаба арміі Кубы. Загінуў у авіякатастрофе.

СЬЕ́РА (ісп. sierra літар. — піла), востраканцовыя горныя хрыбты. Тэрмін ужываецца ў краінах з ісп. і партуг. мовамі (Іспанія, Партугалія, некат. краіны Лац. Амерыкі, а таксама на Філіпінах і інш.). Уваходзіць у склад назваў шматлікіх горных хрыбтоў (напр., Сьера-Невада), дзяржавы Сьера-Леоне ў Афрыцы.

СЬЕ́РА-ЛЕО́НЕ (Sierra Leone), Рэспубліка Сьера-Леоне (Republic of Sierra Leone), дзяржава ў Зах. Афрыцы, на ўзбярэжжы Атлантычнага акіяна. Мяжуе на ПнЗ, Пн і ПнУ з Гвінеяй, на ПдУ з Ліберыяй, на ПдЗ і Пд абмываецца Атлантычным акіянам. Пл. 72,3 тыс. км^2. Насельніцтва 5,4 млн. чал. (2001). Афіц. мова — англійская. Сталіца — г. *Фрытаўн*. Падзяляецца на 3 правінцыі і сталічную акругу. Нац. свята — Дзень незалежнасці (27 крас.).

Дзяржаўны лад. С.-Л. — рэспубліка. Дзейнічае канстытуцыя 1978 (мадыфікаваная ў 1991). Кіраўнік дзяржавы і ўрада — прэзідэнт. Парламент — аднапалатны Нац. сход (68 дэпутатаў).

Прырода. Зах. і паўд. частка С.-Л. — нізінная алювіяльная раўніна; на У — унутр. раўніны (выш. да 200 м), плато (да 1000 м), адгор'і масіву *Фута-Джалон* і Леона-Ліберыйскіх гор (да 1948 м, г. Бінтымані). Карысныя выкапні: алмазы, жал., тытанавыя і хромавыя руды, золата, плаціна, баксіты і інш. Клімат субэкватарыяльны, мусонны. На ўзбярэжжы сярэднямесячныя т-ры самага халоднага месяца (жн.) 24 °С, самага цёплага (крас.) 27 °С. Ападкаў ад 4000 мм за год у гарах на ПдУ, да 2500—2000 мм на ПнЗ. Дажджлівы сезон май—верасень. Шмат паўнаводных рэк. Большая ч. тэр. занята высакатраўнай саваннай з баабабамі, месцамі на У вечназялёныя і лістападна-вечназялёныя лясы з каштоўнымі пародамі дрэў. Пад лесам і хмызнякамі 28% тэрыторыі. У складзе жывёльнага свету малпы, антылопы, зебры, леапарды, карлікавыя слоны, буйвалы, бегемоты; шмат птушак, насякомых. Лясныя заказнікі: Лома-Маўнтынс, Мамунта-Маёза.

Насельніцтва. С.-Л. — шматнацыянальная краіна. Амаль ўсё насельніцтва належыць да моўных падгруп мандэ (у т.л. народ мендэ — 34%, а таксама кона, д'ялонке, малінке, сусу) і зах.-атлантычнай (у т.л. народ тэмне — 31%, а таксама лімба, булом, фульбе, кісі, гола). У г. Фрытаўн і наваколлі жывуць крыёлы, або крэолы С.-Л. (каля 100 тыс. чал., нашчадкі вызваленых рабоўнеграў, якія ў 18—19 ст. прыехалі з





Герб і сцяг **Сьера-Леоне**.

англ. калоній Амерыкі). Мусульмане складаюць 60% вернікаў, прыхільнікі мясц. традыц. культаў — 30%, хрысціяне — 10%. Сярэднегадавы прырост 3,6% (2001). Сярэдняя шчыльн. 74,7 чал. на 1 км^2, на ўзбярэжжы і на З — да 700 чал. на 1 км^2, на ПнУ — каля 10 чал. на 1 км^2. У гарадах жыве каля 35% насельніцтва. У г. Фрытаўн з прыгарадамі каля 700 тыс. ж. (2001). Астатнія гарады невялікія (да 10—20 тыс. ж.). У сельскай гаспадарцы занята каля 66%



эканамічна актыўнага насельніцтва, у апрацоўчай прам-сці — 8%, у горназдабыўной — 7%, на буд-ве і транспарце — 5%, у гандлі і сферы паслуг — 14%. У краіне і за яе межамі каля 2 млн. бежанцаў.

Гісторыя. Найб. стараж. насельнікі С.-Л. — прадстаўнікі народа булом. З 15 ст. тут пасяліліся народы тэмне і мэндэ, пазней — фульбе. У 1462 на ўзбярэжжы з'явіліся партугальцы, якія назвалі краіну С.-Л. (партуг. «Львіныя горы»). З сярэдзіны 16 ст. сюды пранікалі гандляры рабамі. У 1787 англічане заснавалі пасяленне б. неграў-рабоў Фрытаўн (англ. «Горад свабодных»). З 1808 Фрытаўн і прылеглыя тэрыторыі — калонія Вялікабрытаніі; асн. яе насельніцтва складалі вызваленыя афрыканцы-рабы — т. зв. крэолы. Да сярэдзіны 19 ст. крэолы мелі ўласнае выбарнае самакіраванне; калонія лічылася культ. і паліт. цэнтрам брыт. калан. уладанняў у Зах. Афрыцы. Да канца 19 ст. англічане падпарадкоўвалі ўнутр. раёны, якія ў 1896 абвешчаны брыт. пратэктаратам. Пасля 2-й сусв. вайны ў С.-Л. створаны першыя паліт. партыі. У 1957 прынята канстытуцыя, створаны ўласныя парламент і ўрад, які сфарміравала Нар. партыя С.-Л. (НПСЛ). 21.4.1961 абвешчана незалежнасць С.-Л. ў складзе Садружнасці, прэм'ер-міністрам стаў лідэр НПСЛ М.Маргаі (пасля яго смерці ў 1964 — А.Маргаі). Пасля перамогі апазіцыйнага Усенар. кангрэса (УК) уладу захапілі ваенныя. Пасля новага перавароту ў крас. 1968 улада перайшла да УК на чале з С.П.Стывенсам.

19.4.1971 краіна абвешчана рэспублікай, яе прэзідэнтам абраны Стывенс, якога ў 1985 змяніў Дж.С.Мома. У краіне ўсталяваўся аднапартыйны рэжым УК, урад якога праводзіў палітыку частковай нацыяналізацыі гарнарудных прадпрыемстваў, што належалі замежнаму капіталу. У крас. 1992 ваенныя на чале з капітанам В. Страсерам скінулі ўрад УК; у С.-Л. адноўлена шматпартыйнасць, на першых свабодных выбарах у лют. 1996 прэзідэнтам абраны кандыдат Нар. партыі А.Т.Каба. Унутр. становішча С.-Л. застаецца вельмі складаным. З пач. 1990-х г. барацьбу супраць цэнтр. ўрада вядзе Аб'яднаны рэв. фронт, у выніку чаго загінулі і сталі бежанцамі дзесяткі тыс. чалавек. У 1997 і 1999 былі спробы скінуць прэзідэнта Каба (задушаны пры дапамозе нігерыйскіх войск). С.-Л. — чл. ААН (1961), Арг-цыі афр. адзінства, Зах.-Афр. эканам. супольнасці.

Гаспадарка. С.-Л. — адсталая агр. краіна з адносна развітой горназдабыўной прам-сцю. Па эканам. узроўні адна з найбяднейшых краін свету. Валавы ўнутр. прадукт у разліку на 1 чал. — 510 дол. за год (2000). Каля 43% яго ствараецца ў сельскай гаспадарцы, каля 26% — у прам-сці, каля 31% — у абслуговых галінах. Унутр. ўзбр. канфлікты разбуральна ўздзейнічаюць на эканоміку. Аснова яе — сельская гаспадарка. Пад с.-г. ўгоддзямі каля 2,82 млн. га, у т.л. пад ворывам каля 500 тыс. га (каля 29 тыс. га арашаецца), пад шматгадовымі насаджэннямі каля 70 тыс. га, пад пашай каля 2250 тыс. га. Пераважае раслінаводства. У раёнах вырошчвання экспартных культур і каля гарадоў ёсць зоны таварнай гаспадаркі; у астатніх раёнах пераважае дробнатаварная і натуральная гаспадарка. У краіне каля 300 тыс. сял. гаспадарак, ёсць плантацыі экспартных культур. Асн. культуры (штогадовы збор на пач. 1990-х г., тыс. т): рыс (каля 60% пасяўных плошчаў) — каля 600, кукуруза — 15, проса і сорга — 37, маніёк, какава, ямс, тара, батат — разам каля 130, бабовыя — 30; тэхн. і экспартныя культуры: алейная пальма — штогадовы збор 20—50 тыс. т ядраў, кава — 15 тыс. т, какава — 16 тыс. т, пальма рафія (дае тэхн. валакно), імбір, сізаль, кунжут, тытунь, гевея, арэхі кола, цукр. трыснёг. Агародніцтва і трапічнае садоўніцтва. Жывёлагадоўля экстэнсіўная, выкарыстоўвае прасторы саваннаў, развіта пераважна на Пн, дзе няма мухі цэцэ. Пагалоўе (1999, тыс. галоў): буйн. раг. жывёлы — 340, авечак — 330, коз — 180, свіней — 50. Птушкагадоўля (у 1997 — 6 млн. курэй). Развіваецца марское рыбалоўства (штогод каля 150 тыс. т рыбы і 1 тыс. т крэветак). На У краіны лесанарыхтоўкі, у т.л. каштоўнай драўніны. Прам-сць пераважна горназдабыўная і апрацоўчая. У сувязі з ваен. дзеяннямі, а таксама выпрацоўкай радовішчаў здабыча карысных выкапняў змяншаецца. Здабываюць алмазы (164 тыс. каратаў, 1994), золата (каля 1000 кг штогод), рутыл (1,4 млн. т), ільменіт, жал. руду, баксіты, буд. матэрыялы. У 1999 атрымана 240 млн. кВт · гадз электраэнергіі. Невял. прадпрыемствы апрацоўчай прам-сці па вытв-сці харч. прадуктаў, прахаладжальных напіткаў, абутку, мэблі, цыгарэт, гароднінных і садавінных кансерваў, цэменту, паперы, мыла, касметыкі і інш. Ёсць прадпрыемствы металаапр., нафтаперапр., па агранцы і шліфоўцы алмазаў, мукамольныя, тытунёвыя, кандытарскія, аўтазборачныя і цэм. з-ды, дрэваапр., хім. і інш. Развіты саматужныя промыслы. Транспарт аўтамаб., унутр. водны, марскі. Даўж. (тыс. км, 1997): аўтадарог 11,3, у т.л. з цвёрдым пакрыццём 0,9, унутр. водных шляхоў 0,8, у т.л. прыдатных для эксплуатацыі круглы год 0,6. У краіне 20,9 тыс. легкавых, 21,1 тыс. грузавых аўтамашын і аўтобусаў (2000). З 600 км чыгункі эксплуатуецца 84 км. Гал. марскі порт Фрытаўн, паблізу міжнар. аэрапорт. У 2000 экспарт склаў 65 млн. дол., імпарт — 145 млн. дол. У экспарце пераважаюць алмазы, рутыл, бабы, кава, рыба; у імпарце — харч. прадукты, машыны і абсталяванне, паліва, хімікаты. Гал. гандл. партнёры: Вялікабрытанія, Бельгія, ЗША, Італія, Нігерыя. С.-Л. атрымлівае эканам. дапамогу (203,7 млн. дол., 1995) ад міжнар. арг-цый і развітых краін. Грашовая адзінка — леоне.



Да арт. **Сьера-Леоне**. Горад Фрытаўн.

Літ.: Зотова Ю.Н., Смирнов Е.Г., Френкель М.Ю. История Сьерра-Леоне в новое и новейшее время. М., 1994.

К.А.Анцілава (прырода, насельніцтва, гаспадарка).

СЬЕ́РА-МА́ДРЭ-ДЭ-Ч'Я́ПАС (Sierra Madre de Chiapas), Сьера-Мадрэ, горны хрыбет у сістэме Кардыльераў Цэнтр. Амерыкі, на крайнім ПдУ Мексікі і ў Гватэмале. Цягнецца ўздоўж узбярэжжа Ціхага ак. Даўж. каля 350 км, выш. да 4177 м (вулкан Такана). Складзены пераважна з вулканічных парод. Частыя землетрасенні. На наветраных схілах вільготныя трапічныя і мяшаныя лясы, на падветраных — трапічныя рэдкалессі і хваёвыя лясы.

СЬЕ́РА-НЕВА́ДА (Sierra Nevada), хрыбет у сістэме Кардыльераў Паўн. Амерыкі, на ПдЗ ЗША. Даўж. 750 км, выш. 4418 м (г. Уітні). Складзены з гранадыярытаў. Сейсмічны раён. Каля ўсх. падножжа грозевыя вулканы, гарачыя крыніцы. Зах. схіл пакаты, з глыбокімі далінамі, добра ўвільготнены. Расліннасць — вечназялёныя хмызняковыя дубы (да выш. 1000 м), якія змяняюцца хвойнымі лясамі, вышэй за 3000 м — альпійскія лугі. Усх. схіл стромкі, парэзаны цяснінамі, адносна засушлівы. Расліннасць — горныя хваёвыя лясы і рэдкалессі. На вяршынях вечныя снягі. З гор праведзены водаправоды, якія дастаўляюць ваду ў гарады Сан-Францыска і Лос-Анджэлес. Нац. паркі Іасеміцкі, Кінгс-Каньён, Секвоя.

СЬЕ́РА-НЕВА́ДА (Sierra Nevada), горны масіў у Андалускіх гарах, на Пд Іспаніі, самы высокі на Пірэнейскім п-ве (3478 м, г. Муласен). Складзены з крышт. сланцаў, даламітаў, вапнякоў. Вяршыні альпійскага тыпу. Снежнікі, на г. Муласен самы паўд. ў Еўропе ледавік. Радовішча жал. руд (Алькіфе).

СЬЕ́РА-НЕВА́ДА-ДЭ-СА́НТА-МА́РТА (Sierra Nevada de Santa Marta), ізаляваны горны масіў у Паўн. Андах, самы высокі ў Калумбіі, каля берага Карыбскага м. Выш. да 5800 м (г. Крыстобаль-Калон). Складзены пераважна з крышт. і метамарфічных парод, схілы — з асадкавых. На вяршынях вечныя снягі, ледавікі. На паўн. схілах летнезялёныя лясы, на паўд. — ксерафітныя рэдкалессі і хмызнякі, у верхнім

поясе — парамас (высакагорныя лугі з засухаўстойлівымі дзернавіннымі злакамі, падушкападобнымі і разеткавымі раслінамі).

СЬЮДА́Д-БАЛІ́ВАР (Ciudad Bolivar), горад на ПнУ Венесуэлы. Засн. ў 1764 пад назвай Ангастура, сучасная назва (у гонар С.*Балівара*) з 1840-х г. Каля 300 тыс. ж. з прыгарадамі (2001). Порт на р. Арынока (даступны для марскіх суднаў; пераважна вываз жал. руды). Вузел аўтадарог. Аэрапорт. Цэнтр с.-г. раёна (збожжавыя, бавоўнік, жывёлагадоўля). Прам-сць: харч., абутковая, лесапільная. Музей «Талавера». На Пд ад С.-Б. — буйное радовішча жал. руды *Сера-Балівар*. Арх. помнікі калан. перыяду.

СЬЮДА́Д-ГУАЯ́НА (Ciudad Guayana), горад на ПнУ Венесуэлы. Утвораны ў 1961 у выніку зліцця 5 суседніх гарадоў. Каля 500 тыс. ж. (2001). Порт на р. Арынока пры ўпадзенні р. Карані (даступны для марскіх суднаў). Вузел аўтадарог. Аэрапорт. Прам-сць: чорная і каляровая металургія, цэлюлозна-папяровая, хімічная; у раёне здабыча жал. і марганцавых руд, баксітаў. Цэнтр асваення Венесуэльскай Гуаяны; вакол С.-Г. на базе буйных мінер., лясных і гідраэнергетычных (каскад ГЭС на р. Карані) рэсурсаў развіваецца прамысл. комплекс.

СЬЮДА́Д-ТРУХІ́ЛЬЁ (Ciudad Trujillo), назва ў 1936—61 г. *Санта-Дамінга*, сталіцы Дамініканскай Рэспублікі.

СЬЮДА́Д-ХУА́РЭС (Ciudad Juárez), горад на Пн Мексікі, на правым беразе р. Рыо-Брава-дэль-Нортэ, насупраць г. Эль-Паса (ЗША). Засн. ў 1659 пад назвай Эль-Паса-дэль-Нортэ, з 1888 сучасная назва і статус горада. Каля 900 тыс. ж. (2001). Вузел чыгунак і аўтадарог. Аэрапорт. Прам-сць: металаапр., тэкст., бавоўнаачышчальная, гарбарна-абутковая, харчовая. Зборачныя прадпрыемствы кампаній ЗША па вытв-сці спажывецкіх тавараў. Гандл. цэнтр с.-г. раёна (бавоўнік, развядзенне буйн. раг. жывёлы). Ун-т. Цэнтр турызму (пераважна з ЗША).

СЭ́КЛЫ, возера ў Браслаўскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Дзісна, за 2 км на Пн ад г.п. Відзы. Пл. 1,01 км^2, даўж. 1,5 км, найб. шыр. 1,3 км, найб. глыб. 3 м, даўж. берагавой лініі 4,7 км, пл. вадазбору 9,4 км^2. Катлавіна рэшткавага тыпу. Схілы выш. да 3 м, на Пн да 9 м. Берагі нізкія, забалочаныя, пад хмызняком. Пойма шыр. 10—20 м. Дно выслана сапрапелем, месцамі каля берагоў пясчанае. Зарастае. Злучана пратокай з Відзскім возерам, выцякае ручай у р. Дрысвята.

СЭ́ЛІНДЖЭР (Salinger) Джэрам Дэйвід (н. 1.1.1919, Нью-Йорк), амерыканскі пісьменнік. Скончыў Пенсільванскую ваен. акадэмію (1936), вучыўся ў Нью-Йоркскім і Калумбійскім ун-тах. Друкуецца з 1940. Вядомасць прынёс раман «Над бездонню ў жыце» (1951), у якім успрымальны да прыгажосці летуценны падлетак процістаіць практыцызму, канфармізму і спажывецтву дарослых. Аўтар шматлікіх навел, лепшыя з якіх увайшлі ў зб. «Дзевяць апавяданняў» (1953). Героі многіх яго твораў — дзеці, сумленнасць і погляды якіх спрыяюць выяўленню заганаў грамадства. Аўтар цыкла аповесцей пра сям'ю, у т.л. «Вышэй кроквы, цесляры!» (1955), «Сімар: першае знаёмства» (1959), «Фрэні і Зуі» (1961), «Гэпварт 16, 1924» (1965). На бел. мову яго аповесць «Гэпварт 16, 1924» пераклаў П.Марціновіч.

Тв.: Рус. пер. — Над пропастью во ржи: Повести. Рассказы. М., 1991.

Літ.: Галинская И.Л. Философские и эстетические основы поэтики Дж. Д.Сэлинджера. М., 1975. *Т.Я.Камароўская.*

СЭ́МЮЭЛСАН, Сэмуэльсан, Самуэльсан (Samuelson) Пол Энтані (н. 15.5.1915, г. Гэры, штат Індыяна, ЗША), амерыканскі вучоны-эканаміст. Скончыў Гайдпаркскую вышэйшую школу, Чыкагскі і Гарвардскі ун-ты. З 1940 выкладае ў Масачусецкім ун-це (з 1966 праф.). У 1961—68 дарадчык прэзідэнта Дж. Кенэдзі па пытаннях эканомікі. Выступаў за выкарыстанне найноўшых матэм. метадаў у агульнай тэорыі і метадалогіі эканам. навукі. У галіне тэорыі эканам. дынамікі сфармуляваў прынцып адпаведнасці, паводле якога стат. прадказанні эканам. мадэлі і яе дынамічныя паводзіны ўзаемазвязаны («Асновы эканамічнага аналізу», 1948). У галіне тэорыі эканам. дабрабыту распрацаваў крытэрыі, па якіх вызначаецца магчымасць павелічэння дабрабыту ў выніку пэўных змен. У навук. працах па праблемах міжнар. гандлю даказаў, што свабодны міжнар. гандаль садзейнічае зніжэнню адрозненняў паміж даходамі ад працы і капіталу ў розных краінах. У галіне дзярж. фінансаў распрацаваў тэорыю дзярж. расходаў, дзе імкнуўся вызначыць аптымальнае размеркаванне рэсурсаў. Аўтар сусветна вядомага падручніка «Эканоміка» (1945). Нобелеўская прэмія 1970.

СЭ́НДБЕРГ (Sandburg) Карл (6.1.1878, г. Гейлсберг, штат Ілінойс, ЗША — 22.7.1967), амерыканскі паэт. Дэбютаваў у 1916 «Вершамі пра Чыкага». Свабодны верш С. максімальна набліжаны да прозы, яго паэт. своеасаблівасць — у праўдзівым лірычным бачанні свету (зб-кі «Зборшчыкі кукурузы», 1918; «Дым і сталь», 1920; «Камяні спаленага сонцам Захаду», 1922; «Добрай раніцы, Амерыка!», 1928). У традыцыях У.*Уітмена* напісана эпічная паэма «Народ — так!» (1936). Аўтар біяграфіі «Аўраам Лінкальн» (т. 1—6, 1926—39), гіст. рамана «Скала ўспамінаў» (1948), зб. філас. лірыкі «І мёд, і соль» (1963). Аптымізм паэзіі С. звязаны з верай у духоўнасць народа, сац. справядлівасць.

Тв.: Рус. пер. — Линкольн. М., 1961; Избр. лирика. М., 1975; Избранное. М., 1981.
Т.Я.Камароўская.

СЭНДЭ́РА ЛУМІНО́СА (Zendero Luminoso — ісп. «светлы шлях»). Перуанская камуністычная партыя светлага шляху Марыятэгі, экстрэмісцкая леварадыкальная арг-цыя ў Перу. Створана ў 1980 групай перуанскіх камуністаў — прыхільнікаў маоізму. Атрымаўшы падтрымку найбяднейшых пластоў насельніцтва, С.л. разгарнула супраць урада Перу партыз. вайну, ахвярамі якой у 1980—90-я г. сталі каля 30 тыс. чал. Нягледзячы на сур'ёзныя страты, якія С.л. панесла ў пач. 1990-х г., яна кантралюе значныя тэрыторыі на У і ў Цэнтр. раёнах Перу з пераважна індзейскім насельніцтвам.



П.Э.Сэмюэлсан.

СЭНС ЖЫЦЦЯ́ чалавека, філасофская катэгорыя, якая адлюстроўвае прыроду вышэйшых маральных якасцей, выяўляе сацыяльна значную каштоўнасць чалавечага існавання. У межах натурфіласофіі С.ж. атаясамліваюць з імкненнем атрымаць максімум задавальненняў і асалоды (*геданізм*), пошукам асабістай выгады і карысці (*утылітарызм*), жаданнем быць шчаслівым (*эўдэманізм*). Трансцэндэнтная традыцыя дапускае пошук С.ж. па-за яе межамі і звязана з выяўленнем вышэйшай асабістай існасці, далучэнне да якой надае сэнс існаванню чалавека. Крыніцай і пунктам адліку тут выступае *Бог* ці іншы ўсеагульны надпрыродны духоўны пачатак — дух, ідэя і інш. У рэчышчы хрысц. традыцыі (каталіцызм, праваслаўе) С.ж. вызначаецца асн. запаветамі і каштоўнасцямі, выкладзенымі ў Біблії і іншых свяшчэнных кнігах. У пратэстантызме, акрамя аўтарытэту Біблії, важнае значэнне надаецца паўсядзённай працы ў межах свайго прызвання, асвечанага Богам, і аскетычнаму ладу жыцця. У тэорыі кармы чалавек перажывае, адпрацоўвае кармічныя праграмы, самарэалізуецца і павышае асабісты эвалюцыйны ўзровень шляхам адухаўлення матэрыі — творчасці з мэтай дасягнуць найвышэйшага ўзроўню, перарваць ланцуг пераўтварэнняў і выйсці з кругавароту зямнога жыцця. У рус. філасофіі канца 19 — пач. 20 ст. праблема С.ж. разглядалася як сацыяльная, грамадская (П.Л.Лаўроў, М.К.Міхайлоўскі і інш.); духоўна-маральная, асабістая (В.В.Розанаў, У.С.Салаўёў і інш.); сінтэз боскага і чалавечага (Я.М.Трубяцкой і інш.). Разнастайнасць падыходаў да вызначэння С.ж. звязана з праблемай маральнага выбару і свабоды.

Літ.: Смысл жизни: Антология. М., 1994; Смысл жизни в русской философии: Конец XIX — нач. XX в. СПб., 1995; Ничипоров Б.В. Введение в христианскую психологию: Размышления священника-психолога. М., 1994; Франк С.Л. Духовные основы общества. М., 1992.

С.Н.Зень.

СЭ́РВАЧ, рака ў Докшыцкім р-не Віцебскай вобл., Мядзельскім і Вілейскім р-нах Мінскай вобл., правы прыток р. Вілія. Даўж. 85 км. Пл. вадазбору 1105 км². Выцякае з воз. Сэрвач (Докшыцкі р-н), упадае ў Вілейскае вадасх. на ПдУ ад в. Людвінова Вілейскага р-на. Цячэ па ўсх. ч. Нарачана-Вілейскай нізіны. Даліна ў верхнім цячэнні невыразная, на астатнім працягу трапецападобная, шыр. 1,5—2,5 км, месцамі звужаецца да 0,6—1 км. Пойма двухбаковая, слабарасечаная, у верхнім цячэнні забалочаная, тарфяністая, на астатнім працягу сухая, пясчаная. Рэчышча моцназвілістае, у сярэднім цячэнні на працягу 1,8 км каналізаванае, моцна зарастае ў верхнім; шыр. 2—5 м, у сярэднім і ніжнім 15—25 м, месцамі да 35—40 м. Найвыш. ўзровень разводдзя ў пач. крас., сярэдняя выш. над межанным узроўнем 1,3—1,5 м. Замярзае ў сярэдзіне снеж., крыгалом у канцы сакавіка. Веснавы ледаход 5 сут. Сярэднегадавы расход у вусці 7,6 м³/с. Пры ўпадзенні р. Наква ў Сэрвач г.п. Крывічы, каля в. Людвінова створана сажалка. У нізоўях ракі зона адпачынку Вілейка.

СЭ́РВАЧ, возера ў Докшыцкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Сэрвач, за 18 км на Пнз ад г. Докшыцы. Пл. 4,55 км², даўж. 3,8 км, найб. шыр. 2,9 км, найб. глыб. 5,2 м, даўж. берагавой лініі 12,9 км, пл. вадазбору 51,8 км². Катлавіна рэшткавага тыпу, складаецца з вузкага ўсх. і вял. акруглага зах. плёсаў. Схілы выш. 1—3 м, разараныя, на З невыразныя. Пойма забалочаная, укрыта хмызняком, на З пераходзіць у забалочаную, парослую лесам нізіну. Берагі нізкія, пясчаныя, месцамі сплавінныя. Дно выслана сапрапелем, на Пн торфам; мелкаводдзе пясчанае. Шыр. паласы прыбярэжнай надводнай расліннасці 15—20 м, пашырана да глыб. 1,5—2 м, падводная — да глыб. 3 м. Упадаюць некалькі ручаёў, выцякае р. Сэрвач.

СЭ́РВАЧ, балота вярховага (68%), мяшанага (13%) і нізіннага (19%) тыпаў у Докшыцкім (5 тыс. га) і Глыбоцкім (500 га) р-нах Віцебскай вобл., у вадазборы р. Сэрвач. У балоце значныя запасы гідролізнага торфу, уваходзіць у склад Мядзельскай комплекснай базы бітумнай і гідролізнай сыравіны. Пл. 5,5 тыс. га, у межах прамысл. пакладу 5,2 тыс. га. Глыб. торфу да 8,2 м, сярэдняя 3,3 м. Запасы торфу каля 26 млн. т. Сапрапель магутнасцю да 2,6 м. Балота часткова асушана, выкарыстоўваецца пад сенажаць. На неасвоеных тэр. пераважаюць хмызнякі і асокі.

СЭ́РВАЧ, гідралагічны заказнік рэсп. значэння ў Докшыцкім і Глыбоцкім р-нах Віцебскай вобл. Засн. ў 1997 для стабілізацыі гідралаг. рэжыму воз. Сэрвач, р. Сэрвач і яе прытокаў, аховы унікальных прыродна-расл. балотных комплексаў. Пл. 9068 га. У рэльефе гал. месца займае нізіна з марэннымі і камавымі ўзгоркамі, западзінамі, лагчынамі. Глебы ў асн. тарфяна-балотныя, дзярнова-падзолістыя забалочаныя і дзярновыя, частка іх моцна завалунена. Стракатая расліннасць, у асн. балотныя асокі, брыевыя імхі, ёсць насякомаедныя расліны (расянка круглалістая і адваротнаяйцападобная), шмат лек. і дэкар. відаў. Лясная расліннасць з елкі, хвоі, бярозы павіслай і пушыстай, вольхі чорнай, шэрай і інш. У Чырв. кнізе цынклідыум стыгійскі, ласняк Лёзеля, пустапялёснік зялёны, сон лугавы.

П.І.Лабанок.



СЭ́РЦА, цэнтральны орган *крывяноснай сістэмы* чалавека, пазваночных і некат. беспазваночных (членістаногіх, малюскаў), які забяспечвае рытмічнымі скарачэннямі кроваварот. Тыпы С. адрозніваюцца марфалагічна: пульсуючыя сасуды ў кольчатых чарвей, галатурый, насякомых, ланцэтніка; ампулярныя дадатковыя С. (у насякомых, галаваногіх малюскаў, міксін); лімфатычныя С. ў рыб, амфібій, рэптылій; трубчастыя (у большасці членістаногіх, ракападобных, абалоннікаў); камерныя (у малюскаў і пазваночных; двухкамерныя — у рыб; трохкамерныя — у земнаводных; чатырохкамерныя — у кракадзіла, птушак, млекакормячых).



Сэрца чалавека: 1 — правы жалудачак; 2 — правая вянечная артэрыя; 3 — правае вушка; 4 — перыкард (адрэзаны); 5 — верхняя полая вена; 6 — аорта; 7 — плечагалаўны ствол; 8 — левая агульная сонная артэрыя; 9 — лёгачны ствол; 10 — левае вушка; 11 — пярэдняя міжжалудачкавая галіна левай вянечнай артэрыі; 12 — вялікая вена сэрца; 13 — левы жалудачак.

С. чалавека — полы мышачны орган, заключаны ў калясардэчную сумку (перыкард). Размешчана паміж лёгкімі ў міжсценні грудной поласці, мае форму зрэзанага конуса. У дарослага чалавека даўж. С. 10—15 см, сярэдняя маса 250 г у жанчын, 330 г у мужчын. Перагародка падзяляе С. на правую і левую палавіны (правая ў пярэдняй частцы цела, левая — у задняй). Кожная з палавін мае перадсэрдзе (уверсе) і размешчаны пад ім жалудачак. «Шкілет» С. складаецца са шчыльнай валакністай злучальнай тканкі (з участкамі храстковай), утвораны мембраннай перагародкай, фібрознымі трохвугольнікамі і кольцамі. З ім звязаны клапаны сэрца і прымацавана большасць мышачных валокнаў. Сценка С. ўтворана папярочна-паласатай сардэчнай мышачнай тканкай (міякардам), якая звонку абкружана эпікардам, унутры выслана эндакардам. Рух крыві ў адным напрамку забяспечваецца сардэчнымі клапанамі, якія адкрываюцца толькі ў адным напрамку (з перадсэрдзяў у жалудачкі і з жалудачкаў у артэрыі). С. дарослага чалавека скарачаецца 55—70 разоў за мін і пераганяе за гэты час 4,5—5 л крыві. Кожны цыкл сардэчнай дзейнасці складаецца са скарачэння (*сістала*) перадсэрдзяў, потым жалудачкаў і паўзы (*дыястала*), у час якой сардэчная поласць напаўняецца крывёю і аднаўляецца скарачальная энергія С. Дзейнасць С. рэгулюецца нейрагумаральнымі механізмамі. Сардэчная мышца валодае аўтаматызмам (можа скарачацца і без удзелу ц.н.с.). С. забяспечваецца крывёю каранарнымі (вянечнымі) артэрыямі, якія ўтвараюць густую капілярную сетку; інервуецца галінкамі блукальнага і сімпатычнага нерваў. Хваробы С. чалавека вывучае *кардыялогія*.

Літ.: Шмальгаузен И.И. Основы сравнительной анатомии позвоночных животных. 4 изд. М., 1947; Новиков И.И. Сердце и сосуды: Онтогенез и восстановление нейрорегуляторной системы. Мн., 1990; Ромер А.Ш., Парсонс Т.С. Анатомия позвоночных: Пер. с англ. Т. 1—2. М., 1992.

А.С.Леанюк.

СЭРЦАПАДО́БНІКІ (Cardiidae), сямейства марскіх малюскаў надатр. сапр. пласцінасташчэлепных (пласцінастажабравых). Каля 30 родаў, больш за 250 відаў. Пашыраны ўсюды. Жывуць на мелкаводдзі, пераважна ў цёплых водах. Фільтратары. Найб. вядомыя прадстаўнікі сям.: серыпес грэнландскі (Serripes groenlandicus, самы вял. сярод С.), С. ядомы (Cerastoderma edule), С. Ламарка (C. lamarcki), С. рабрысты (Cardium costata).

Даўж. ракавіны да 10 см. Створкі моцна ўздутыя, маюць шырока расстаўленыя рабрынкі, часам узброеныя шыпамі і лускавінкамі. Нага моцная, вузкая, падоўжаная. З яе дапамогай С. перамяшчаюцца, закопваюцца ў грунт, робяць скачкі. Кормяцца пераважна планктонам. Буйныя віды ядомыя.

А.М.Петрыкаў.

СЭ́СІЛ, Сесіл (Cecil) Эдгар Олджэрнан Роберт Гэскайн (14.9.1864, Лондан — 24.11.1958), брытанскі дзярж. дзеяч. Скончыў Оксфардскі ун-т (1886), юрыст. З 1906 дэпутат брыт. парламента. З пач. 1-й сусв. вайны ў Міжнар. к-це Чырв. Крыжа. У 1915—16 нам., у 1916—18 міністр замежных спраў Вялікабрытаніі. У вер. 1916 выдаў мемарандум з прапановай стварэння пасля вайны міжнар. трыбунала для вырашэння міждзярж. спрэчак: многія палажэнні мемарандума пакладзены ў аснову праекта стварэння *Лігі Нацый*. Удзельнік *Парыжскай мірнай канферэнцыі 1919—20*, адзін са стваральнікаў статута Лігі Нацый. У 1920—23 прадстаўляў у Лізе Нацый Паўд.-Афр. Саюз. У 1923—45 прэзідэнт Лігі Нацый. Імкнуўся ператварыць яе ў моцную арг-цыю, здольную ўтаймоўваць агрэсараў; выступаў супраць яп. агрэсіі ў Кітаі, італьян. — у Эфіопіі, *Мюнхенскага пагаднення 1938*; адстойваў спыненне гонкі ўзбраенняў, але не сустрэў падтрымкі ад урадаў краін — чл. Лігі Нацый. Нобелеўская прэмія міру 1937.

СЭ́СЮ, Тоё Ода, Іміна (1420, Місу, Японія — 1506), японскі жывапісец, найбуйнейшы майстар манахромнага жывапісу «суйбоку-га». Быў будыйскім святаром. Вучыўся ў Дзёсэцу, Сюбун. У 1467 або 1468 быў у Кітаі, дзе размаляваў павільён Лібуюань імператарскага палаца ў Пекіне. Працаваў у традыцыях кіт. жывапісу перыяду Паўд. Сун, у жанры пейзажа («Зімовы пейзаж», «Пейзажы чатырох пор года»), імкнуўся да свабоднай трактоўкі рэальных форм, што садзейнічала стварэнню вобразаў, афарбаваных асабістым светаўспрыманнем мастака. Уласцівыя творам суровасць, адчуванне неспакою і дынамізм С. перадаваў у 2 стылістычных манерах: «сін» (ломаныя лініі малюнка, нервовыя мазкі-кропкі) і «хабоку» (рэзкія пэндзлевыя мазкі, прасторавыя і святлапаветраныя эфекты).



Сэрцападобнікі: 1 — ціхаакіянскі; 2 — вялікі; 3 — жоўты; 4 — паўночны; 5 — серыпес грэнландскі; 6 — валасаты.

Літ.: Воронова Б.Г. Тойо Ода. М., 1958.

СЭУ, гл. *Савет эканамічнай узаемадапамогі*.

СЭЦЭ́СІЯ (лац. secessio ад secedo адыходжу), 1) у Стараж. Рыме форма барацьбы *плебеяў* супраць *патрыцыяў* за свае правы. Плебеі дэманстратыўна пакідалі рым. абшчыну і адыходзілі па-за межы горада (на Свяшчэнную гару ці Авенцінскі ўзгорак), які заставаўся фактычна без ваен. абароны, бо плебеі складалі асн. масу рым. арміі. Гэта прымушала патрыцыяў ісці на ўступкі. У выніку 1-й С. (494 да н.э.) уведзена пасада нар. (плебейскага) трыбуна, у выніку 2-й С. (449 да н.э.) — далейшыя ўступкі патрыцыяў і фіксацыя Законаў 12 табліц. 2) У Зах. Беларусі — фракцыя ў ЦК КПЗБ. Арганізацыйна афармілася восенню 1924 і адкрыта заявіла пра свае погляды на *Другой канферэнцыі КПЗБ*. Арганізатар і кіраўнік С. — М.І.Гурын-Маразоўскі, да яго далучыліся А.Тамашэўскі, Л.І.Родзевіч, А.Р.Капуцкі і інш. С. ставіла бел. нац. інтарэсы вышэй за класавыя. Выступала супраць падпарадкавання КПЗБ Кампартыі Польшчы, супраць лініі КПЗБ на паліт. і арганізац. размежаванне на левых і правых у бел. нац. фракцыі сойма. Лічыла мэтазгодным узняць у 1925 узбр. сял. паўстанне пад лозунгам далучэння Зах. Беларусі да БССР, нягледзячы на яго поўную бесперспектыўнасць. Свае патрабаванні выклала ў «Камунікаце». С. асуджана кіраўніцтвам КПЗБ, КПП і Камінтэрна, ініцыятары і кіраўнікі С. выключаны з партыі. Частка яе прыхільнікаў прызнала свае памылкі і была адноўлена ў КПЗБ (Родзевіч, Капуцкі і інш.). Выступленне С. з'явілася штуршком да перагляду далейшай тактычнай лініі КПЗБ, выпрацоўкі новага канцэптуальнага падыходу да развіцця нац.-вызв. руху ў краі.

Літ.: Орехво Н.С. Дела и люди КПЗБ: Воспоминания. Мн., 1983; Ладысеў У. Цяжкі шлях выпрабаванняў // Бел. гіст. часоп. 1994. №1.

СЮАНЬХУА́, горад на Пн Кітая, у даліне р. Янхэ, прав. Хэбэй. Каля 250 тыс. ж. (2001). Цэнтр раёна здабычы жал. руды. Прам-сць: чорная металургія, цяжкае машынабудаванне, папяровая.

СЮА́НЬЦЗАН, Чань Хуэй (602, прав. Хэнань, Кітай — 664), кітайскі падарожнік. Будыйскі манах. У 629—645 у пошуках свяшчэнных будыйскіх кніг ажыццявіў падарожжа ў Індыю, адкуль прывёз 657 будыйскіх рэліг. тэкстаў. Аўтар твора «Нататкі пра краіны захаду», які змяшчае шмат звестак пра геаграфію, этнаграфію і гісторыю Цэнтр. Азіі і Індыі і дагэтуль мае вял. навук. каштоўнасць. Падарожжу С. прысвечаны адзін з найб. славутых помнікаў кіт. л-ры — раман У Чэнэня «Падарожжа на Захад» (16 ст.).

СЮБА́РАВА Эма Пятроўна (8.4.1897, г. Валміера, Латвія — 10.6.1983), бел. вучоны ў галіне селекцыі пладовых культур. Д-р с.-г. н. (1963). Засл. дз. нав. Беларусі (1967). Скончыла 1-ы Маскоўскі ун-т (1924). З 1957 у БелНДІ бульбаводства і плодаагародніцтва (заг. аддзела, у 1972—73 заг. лабараторыі). Аўтар сартоў вішні (Гронкавая, Навадворская, Уладзімірская палепшаная), слівы (Ранняя лошыцкая, Мінская, Беларуская), чарэшні (Народная, Паўночная, Красуня, Мускатная, Залатая лошыцкая). Сааўтар шматлікіх сартоў яблыні і грушы.

Тв.: Вішня. Мн., 1954; Черешня. Мн., 1964.

СЮЖЭ́Т (ад франц. sujet прадмет), у літаратуры — сістэма дзеяння ў творы. Вызначаецца *канфліктам*, які з'яўляецца рухавіком дзеяння. Цесна звязаны з *кампазіцыяй*. Дзеянне твора праяўляе сябе ў знешніх і ўнутр. сувязях герояў з жыццём. Знешнія сувязі (ствараюцца ўчынкамі, размовамі-дыялогамі персанажаў) матэрыялізуюць дзеянне і, па сутнасці, з'яўляюцца адзіным чынникам С. ў творах драм. жанраў. Унутр. сувязі (у драме вынікаюць са знешніх) выяўляюцца найб. у *падтэксце*. У драм. творах С. звычайна вельмі выразны, вонкава актыўны, фабульны (*Фабула* — частка С.). Для С. эпічных твораў характэрна спалучэнне знешніх (фабульных) і ўнутр. (псіхалагічных) сувязей. У іх пераважае адзін пэўны тып С., што дыктуецца індывід. аўтарскім стылем. Нават у творах аднаго пісьменніка-эпіка розныя ідэйна-эстэт. задачы, матэрыял, манера пісьма вызначаюць розны характар сюжэтных сувязей. Своеасаблівасць С. тлумачыцца і інтэнсіўнасцю дзеяння. У лірыцы С. ствараецца плынню перажыванняў, настрояў лірычнага героя; яго своеасаблівасць залежыць ад характару і сілы лірычнага перажывання, дыктуецца светаадчуваннем аўтара.

У С. функцыянуюць усе элементы зместу твора, у т.л. прадметныя апісанні, партрэтныя характарыстыкі і інш. кампаненты, што выглядаюць статычнымі паводле матэрыялу. Сюжэтна функцыянальныя розныя ўстаўныя элементы (паданні, казкі, прытчы), назва твора, эпіграф, часта прысвячэнне — кампаненты, якія ўскосна, асацыятыўна падключаны да дзеяння ў творы. Пазасюжэтныя элементы — апісанні, што маюць толькі факталагічнае, інфармацыйна-пазначальнае значэнне і становяцца такім чынам бязвобразнымі ў маст. сістэме твора. Некат. літ.-знаўцы разглядаюць С. як сістэму знешняга дзеяння ў творы.

Уыяўленчым мастацтве — падзея ці сітуацыя, адлюстраваная ў творы фігуратыўнага мастацтва і часта пазначаная ў яго назве. У адрозненне ад *тэмы* ўяўляе сабой канкрэтнае, дэталёвае, вобразна-апавядальнае раскрыццё маст. ідэі. Асаблівая складанасць С. характэрна для твораў быт. і гіст. жанраў.

Літ.: Кожинов В. Сюжет, фабула, композиция // Теория литературы: Основные пробл. в ист. освещении. М., 1964; Пяткевіч А. Сюжэт. Кампазіцыя. Характар. Мн., 1981. *А.М.Пяткевіч (літаратура).*

СЮЗЕРЭНІТЭ́Т (ням. Suzeränität ад франц. suzerainеté), у сярэдневяковай Еўропе сістэма асабістых іерархічных адносін паміж сюзерэнам (кароль, герцаг, князь) і яго васаламі (гл. *Васалітэт*). Адносіны С. забяспечвала ступенчатая структура феад. уласнасці, якая замацоўвала за сюзерэнам вяршэнства ў паліт., ваен., судовых і інш. справах. З утварэннем цэнтралізаваных дзяржаў паўнамоцтвы ўлады паступова канцэнтраваліся ў руках караля, які ператвараўся ў суверэннага манарха. У форме С. будаваліся і міжнар.-прававыя адносіны паміж моцнымі і больш слабымі васальнымі дзяржавамі.

СЮІ́ТА (франц. suite літар. — рад, паслядоўнасць), 1) інструментальны муз. твор шматчасткавай цыклічнай будовы, які складаецца з адносна самаст. кантрастных частак, аб'яднаных агульнай маст. задумай. Ад *санаты* і *сімфоніі* адрозніваецца больш простай муз. драматургіяй і структурай, адсутнасцю рэгламентацыі колькасці і паслядоўнасці частак, а таксама сувяззю з песняй і танцам. 2) Харэаграфічная кампазіцыя з некалькіх танцаў, самаст. твор або ў складзе балетнага спектакля.

Вытокі С. ў супастаўленні павольнага і хуткага танцаў, вядомых са старажытнасці. С. рознага віду існуюць з 16 ст., у т.л. пад назвай *дывертысмент*, партыта, *серэнада*. У 17—18 ст. складалася з асн. (алеманды, куранты, сарабанды, жыгі) і інш. танцаў, а таксама нетанц. частак (арыя, прэлюдыя і інш.). З 19 ст. ствараюцца арк. нетанц. С. (П.Чайкоўскі), а таксама праграмныя («Шахеразада» М.Рымскага-Корсакава). Вядомы С., якія складаюцца з музыкі опер, балетаў, а таксама музыкі да тэатр. пастановак.

У бел. музыцы найб. шматлікія і разнастайныя С. для сімф. аркестра (М.Аладаў, А.Клумаў, Р.Пукст, Я.Цікоцкі), у т.л. праграмныя («Песні міру» У.Алоўнікава, «Піянерская сюіта» Г.Вагнера, «Забавы» В.Войціка, «Палеская сюіта» Я.Глебава, «Карнавальная сюіта» Я.Дзягцярыка», «Калядныя забавы» Р.Суруса, «Кірмашовыя замалёўкі» Л.Шлег і інш.); для аркестра бел. нар. інструментаў (В.Іваноў, Э.Зарыцкі, Дз.Камінскі, П.Падкавыраў, «Раёк» А.Мдывані, «Батлейка» В.Помазава, «Мінская сюіта» К.Цесакова і інш.); для асобных інструментаў з сімф. аркестрам (Мдывані, Падкавыраў і інш.) і камернага, стр. аркестра, рознага складу ансамбляў, эстр. аркестра. Значнае месца займаюць С. для хору, салістаў і аркестра (Вагнер, І.Кузняцоў, Мдывані, Ю.Семяняка, Дз.Смольскі, Сурус, Цесакоў, У.Чараднічэнка, Шлег і інш.), а таксама на аснове твораў інш. жанраў: балетаў (Вагнер, Глебаў, В.Залатароў, Кандрусевіч), аперэты (Сурус), музыкі да спектакляў драм. т-раў, кінафільмаў (Ю.Бяльзацкі, Глебаў, Дз.Лукас і інш.).

Літ.: Попова Т.В. Сюита. М., 1963.

Т.А.Дубкова.

СЮЙ БЭЙХУ́Н, Жу Пэон (19.6.1895, прав. Цзянсу, Кітай — 26.9.1953), кітайскі жывапісец і графік. Вучыўся ў Шанхаі ў свайго бацькі і ў Парыжы (1919). З 1927 праф. Шанхайскага ін-та жывапісу, выкладаў у Цэнтр. ун-це ў Нанкіне (да 1945). З 1949 дырэктар Цэнтр. АМ ў Пекіне. Адзін са стваральнікаў новага кірунку ў кіт. жывапісе, які аб'ядноўвае нац. маст. традыцыі з еўрап. рэаліст. жывапісам. Працаваў у жанрах «кветкі-людзі», «людзі», у тэхніках акварэльнага і алейнага жывапісу. Творы, прысвечаныя прыродзе («Конь адпачывае», 1930; «Кошкі», 1930-я г.), побыту і гісторыі («Сычуанцы носяць ваду», 1937), вылучаюцца дакладнасцю ліній і мяккай лепкай формы. Вастрынёй псіхал. і сац. характарыстык адметныя партрэты Р.Тагора (1942), будаўніка Жэнь Цзідуна (1952) і інш. Іл. гл. таксама да арт. *Кітай*.

Літ.: Виноградова Н.А. Сюй Бэйхун: Альбом. М., 1980. *С.У.Пешын.*

СЮЛІ́-ПРУДО́М [Sully-Prudhomme; сапр. Прудом (Prudhomme) Рэнэ Франсуа Арман; 16.3.1839, Парыж — 6.9.1907], французскі паэт; прадстаўнік групы «Парнас». Чл. Франц. акадэміі (з 1881). Вывучаў права і дакладныя навукі ў Парыжскім ун-це. Як пісьменнік фарміраваўся пад уплывам рамантыкаў. Вядомасць прынёс першы зб. «Стансы і вершы» (1865). Зб-кі «Адзінота» (1869), «Дарэмная пяшчота» (1875), паэма «Лёсы» (1872) адметныя пластычнасцю вобразаў, жывапіснасцю, філас. праблематыкай. У працяг ант. традыцыі (пераклаў 1-ю ч. паэмы Лукрэцыя «Аб прыродзе рэчаў», 1869) напісаў філас.-алегарычныя паэмы «Справядлівасць» (1878) і «Шчасце» (1888), у рэчышчы філасофіі пазітывізму — трактаты «Прадмова» (1869), «Псіхалогія свабоднага выбару» (1906) і інш. Аўтар шматлікіх нарысаў, сацыялагічных і мастацтвазнаўчых прац. Нобелеўская прэмія 1901.

Тв.: Рус. пер. — Избр. стихотворения. М., 1924; у кн.: Французские стихи в переводе русских поэтов XIX—XX вв. М., 1969.

Е.А.Лявонава.



Сюлі-Прудом.

СЮЛЬЖЫ́Н Васіль Пятровіч (н. 9.5.1946, в. Сяргеевічы Пухавіцкага р-на Мінскай вобл.), бел. спартсмен (барацьба вольная, 1-я сярэдняя вагавая катэгорыя). Засл. майстар спорту СССР (1973). Скончыў Бел. ін-т фіз. культуры (1974). З 1976 старшы трэнер Бел. рэсп. савета фіз-культ.-спарт. т-ва «Дынама». Чэмпіён свету (1973, Тэгеран), Еўропы (1972, г. Катавіцы, Польшча; 1973, г. Лазана, Швейцарыя).

СЮНІ́СКАЕ ЦА́РСТВА, Сюнійскае царства, сярэдневяковая арм. дзяржава ў 2-й пал. 10—12 ст. у вобл. Сюнік (паўд.-ўсх. ч. Арменіі). Заснавальнік — вял. князь Смбат, які ў 970 абвясціў сябе царом. Да сярэдзіны 11 ст. правіцелі С.ц. прызнавалі вярх. ўладу *Багратыдаў* — цароў *Анійскага царства*. Найб. росквіту С.ц. дасягнула ў 1-й пал. 11 ст. пры царах Васаку I і Смбаце II (мела 43 крэпасці, 48 манастыроў і больш за 1 тыс. вёсак). Яе сталіца — г. Капан. У 1170 С.ц. заваявалі *сельджукі*.

СЮРПРЫ́З (франц. surprise), прыемнае нечаканае здарэнне; падарунак; нечаканасць. Напр., навагодні С.

СЮРРЭАЛІ́ЗМ (франц. surréalisme літар. — звышрэалізм), кірунак у літаратуры і мастацтве 1-й пал. 20 ст. Узнік у Францыі, паступова ў той ці інш. форме пашырыўся ў інш. краінах Еўропы, Лац. Амерыкі і ЗША. Тэрмін «С.» уведзены ў 1918 Г.Апалінэрам, яго заснавальнік і гал. тэарэтык — А.Брэтон, аўтар першага «Маніфеста сюррэалізму» (1924). Фарміраванне С. звязана з дзейнасцю парыжскай асацыяцыі пісьменнікаў і мастакоў і яе час. «Littérature» («Літаратура», 1919—24) і «Révolution surréaliste» («Сюррэалістычная рэвалюцыя», 1924—29), у якіх распрацоўвалася праграма кірунку, што грунтавалася на дасягненнях *сімвалізму*, *дадаізму*, *метафізічнага жывапісу*, філас. вучэнні З.Фрэйда. Гал. мэта С. — пошук «сапраўднай рэальнасці», якая выяўляецца



Сюй Бэйхун. Кошкі. 1930-я г.

праз асабіста-пачуццёвую сферу суб'ектыўнасці, некантралюемую творчасць. У л і т а р а т у р ы (пераважна ў паэзіі) для С. характэрна «аўтаматычнае пісьмо» (запіс слоў, вобразаў і фрагментаў маўлення, што ўзнікалі ў выніку спантанных асацыяцый), адмова ад рыфмы, метрыкі, чляненне на строфы, завершасальныя спалучэнне форм, зрокавая няўстойлівасць, зменлівасць вобразаў, частае выкарыстанне эратычных матываў. На Беларусі ў сюррэалістычнай манеры працавалі і працуюць мастакі В.Альшэўскі, М.Селяшчук, Г.Скрыпнічэнка, У.Тоўсцік і інш. У к і н е м а т о г р а ф е сюррэалістычныя фільмы вызначаюцца туманнай сімвалічнасцю, алагічнасцю вобразаў, прыгнечаным эратызмам, адчуваннем суму, адзіноты,



Да арт. **Сюррэалізм**. С.Д а л і. Сон, выкліканы палётам пчалы вакол граната за хвіліну да абуджэння. 1944.



Да арт. **Сюррэалізм**. Х.М і р о. Жанчына і птушка ў месячным святле. 1949.

насці, граматыка-сінтакс. і жанравакампазіцыйнай арганізацыі (Л.Арагон, Р.Вітрак, Р.Дэснос, Ж.Както, Р.Кено, П.Рэвердзі, Сен-Жон Перс, Ф.Супо, Т.Тцара, Р.Шар, П.Элюар і інш.). Паўплываў на авангардысцкія кірункі ў л-ры 2-й пал. 20 ст. (*тэатр абсурду, «новы раман»*, канкрэтная паэзія і інш.). Асобныя элементы С. актуалізуюцца і ў сучаснай бел. л-ры: творчасць удзельнікаў суполкі «Бум-Бам-Літ» А.Бахарэвіча, З.Вішнёва, В.Жыбуля, С.Мінскевіча, А.Туровіча і інш. У в ы я ў л е н ч ы м м а с т а ц т в е для дасягнення глыбіні падсвядомасці мастакі распрацоўвалі спец. прыёмы «псіхічнага аўтаматызму», спантаннага формаўтварэння (выпадковыя лініі, зробленыя алоўкам на паперы, *дэкалькаманія, калаж, фюмаж, фратаж*). С. у выяўл. мастацтве развіваўся ў 2 асн. кірунках: А.Масон, Х.Міро, М.Эрнст уводзілі пазасвядомы пачатак у творчы працэс, аперыравалі свабоднымі вобразамі і адвольнымі формамі, якія часта пераходзілі ў абстракцыю; С.Далі, П.Дэльво, Р.Магрыт, І.Тангі імкнуліся выявіць ірэальны вобраз з ілюзорнай дакладнасцю праз манеру пісьма, блізкую да акад. жывапісу; сродкамі фігуратыўнага мастацтва яны стваралі вобраз, немагчымы ў рэальнасці (расцяканне цвёрдых прадметаў, празрыстасць шчыльных аб'ектаў, расслаенне фігуры на некалькі выяў і інш.). Для абодвух кірункаў характэрны алагізм, парадаксмерці (С.Брэкхейдж, Л.Буньюэль, Далі, М.Дэрэн, К.Харынгтан, К.Энгер і інш.).

Літ.: К у л и к о в а И.С. Сюрреализм в искусстве. М., 1970; А н д р е е в Л.Г. Сюрреализм. М., 1972; К а п т е р е в а Т. Дадаизм и сюрреализм // Модернизм. 3 изд. М., 1980; Антология французского сюрреализма, 20-е гг.: Пер. с фр. М., 1994; Л я в о н а в а Е.А. Плыні і постаці. Мн., 1998; Сюрреализм и авангард. М., 1999; В и р м о А. и О. Мэтры мирового сюрреализма: Пер. с фр. СПб., 1996; P a s s e r o n R. Encyclopedia surrealizmu: Przekł. z fr. Warszawa, 1993.

Е.А.Лявонава (літаратура), *С.У.Пешын.*



Да арт. **Сюррэалізм**. Р.М а г р ы т. Помста.

СЯ, паводле традыц. кіт. гістарыяграфіі — першая дынастыя кіт. імператараў (23—18 ст. да н.э.). Сказанні пра С. змешчаны ў многіх стараж.-кіт. пісьмовых помніках, найб. поўныя — у «Гістарычных нататках» Сыма Цяня (2—1 ст. да н.э.). Да 20 ст. звесткі пра С. вучоныя лічылі легендай. Але пасля знаходак помнікаў часоў дынастыі *Інь*, якую таксама лічылі легендарнай, большасць гісторыкаў трымаецца версій, што С. існавала як саюз протакіт. плямён у сярэднім бас. р. Хуанхэ, але дагэтуль ніхто з даследчыкаў няздольны атаясаміць яе ні з адной вядомай археал. культурай.

СЯБРЫ́, назва людзей у ВКЛ, якія супольна валодалі і карысталіся ворнай зямлёй, прамысл. ўгоддзямі, сродкамі вытворчасці. Называліся таксама дольнікамі, патужнікамі, саўдзельнікамі, таварышамі. Упамінаюцца ў Статуце ВКЛ 1529. С. маглі быць сяляне, у т.л. і без уласнай гаспадаркі, свецкія і духоўныя феадалы, купцы. З умацаваннем феад.-прыгонніцкай сістэмы і развіццём грашовых адносін сяброўскае землекарыстанне паступова ператварылася ў падворна-спадчыннае. Рэшткі супольнага землекарыстання (грамадскае карыстанне лугамі, пашаю) на Беларусі захаваліся да пач. 20 ст.

«СЯБРЫ́», т в о р ч а е а б ' я д н а н н е «С т у д ы я «С я б р ы». Створана ў 1974 як вак.-інстр. ансамбль Гомельскай абл. філармоніі, з 1990 пры Мінскай філармоніі, з 1992 — сучасная назва. Маст. кіраўнік А.*Ярмоленка*. Муз. кіраўнікі В.Бадзьяраў (1977—81), М.Сацура (з 1975). Творчасці ансамбля ўласціва своеасаблівая пеўчая манера, спалучэнне арыгінальнай мелодыкі з паэт. зместам, выразнасцю муз. мовы. У першым складзе «С.» выступалі: А.Ярмоленка (вакал), Сацура (клавішныя, вакал), Г.Балабанаў (ударныя), А.Клімовіч (флейта, дудка, саксафон), В.Прыгажаеў (гітара), А.Шчатаў (бас-гітара, вакал). У розныя гады ў склад ансамбля ўваходзілі: А.Аўдзяевіч (труба, трамбон), А.Газізаў (гітара), А.Каляда (клавішныя), В.Разанаў (бас-гітара), В.Чырвоны (усе вакал). У сучасным складзе: Алеся (А.А.Ярмоленка; салістка), С.Герасімаў (гітара, вакал), Сацура, А.Цераховіч (ударныя), У.Чыж (гітара, клавішныя, вакал), А.Ярмоленка, С.Ярмоленка (бас-гітара, камп'ютэрная аранжыроўка, клавішныя). У рэпертуары песні бел. і рас. кампазітараў, у т.л. У.Будніка, Я.Глебава, Л.Захлеўнага, А.Іванова, І.Іванова, А.Пахмутавай, Я.Пцічкіна, С.Касторскага, Сацуры, Э.Ханка; песенныя праграмы: «Шлях да Беларусі», «Анатоль», «Ёсць лёс у мяне», «Я з вамі не развітваўся ніколі», «Перажывём», «Нашы

песні — наша жыццё», якія з'яўляюцца і назвамі дыскаў. Пры ансамблі дзейнічаюць маладзёжная студыя «Сябры» (з 1992, кіраўнік А.Ярмоленка), дзіцячы ансамбль «Буслік» (з 1993, кіраўнік У.Сарокін). Лаўрэат Усесаюзных конкурсу сав. песні (1977), тэлеконкурсу «З песняй па жыцці» (1979). Прэмія Ленінскага камсамола Беларусі 1984.



Ансамбль «Сябры».

СЯБРЫ́НА, народны звычай сумеснага карыстання сенажаццю, пашай, пчоламі, падоранай жывёлай і г.д. Саўладальнікаў маёмасці называлі *сябрамі*. Характэрнымі рысамі адносін паміж імі была дружба і ўзаемадапамога. Звычай С., як і *бонда*, патранімічнага паходжання. Была найб. пашырана ў 14—16 ст. на Пд Беларусі. Рэшткі С. захоўваліся да 20 ст. Вядома была і на Украіне.

«СЯБРЫ́НА», клуб аматараў бел. нар. творчасці ў г. Вільнюс. Засн. ў 1987 пры Літ. Рэсп. Палацы культуры прафсаюзаў. Аб'ядноўвае больш за 200 чал. розных нацыянальнасцей. Асн. мэта — зберагчы на літ. зямлі, дзе пражывае больш за 50 тыс. беларусаў, бел. звычаі, бел. мову, нар. песні, адрадзіць бел. святы, нар. гульні. Праводзіць сустрэчы з бел. вучонымі і дзеячамі культуры, гісторыкамі, мастацтвазнаўцамі, філолагамі, пісьменнікамі. Арганізоўвае вечарыны, прысвечаныя гіст. і культ. датам Беларусі, сустрэчы-вечарыны на святы, канцэрты, выстаўкі маладых бел. мастакоў — т.зв. «беларускі куток» на штогадовым літ. свяце-кірмашы «Казюкас». Для дзяцей горада праводзіць навагоднія і інш. святы на бел. мове. Па ініцыятыве клуба «С.» на літ. радыё арганізавана і вядзецца на бел. мове перадача «Беларускае слова на хвалях Літвы», у газ. «Lietuva» («Літва») выходзіць старонка клуба — «Пагоня». З 1990 на літ. тэлебачанні заснавана перадача «Запрашае «Сябрына», якая выходзіць у эфір 2 разы на тыдзень. Падтрымлівае цесныя сувязі з Бел. фондам культуры, згуртаваннем беларусаў свету «Бацькаўшчына», Нац. навук.-асв. цэнтрам імя Ф.Скарыны. Пры клубе дзейнічае аднайм. хор бел. нар. песні.

СЯВЕ́НЬКА, ёмістасць для ручной сяўбы ў многіх народаў. На Беларусі рабілі з саломы, лазы, лубу (кары ліпы, вяза), тонкай хваёвай дранкі і інш., дно — з тонкай дошчачкі. Сустракаліся С. палатняныя (каркас з тонкіх дубцоў, расшчэпленых папалам, дно з тонкіх драўляных клёпак). Мелі разнастайную форму: круглую, авальную, прамавугольную, пяцівугольную, звычайна крыху расшыраныя ўверсе. Памеры С.: вышыня 17—26, даўжыня 36—60, шырыня 33—36 см. Для нашэння С. рабілі вушкі (з сыраматнай скуры, пянькі, дроту), да якіх прывязвалі рэмень, вяроўку, зрэдку ручнік, што надзяваліся цераз плячо. У паўд.-зах., зах., цэнтр. і паўн. раёнах Беларусі найб. пашыраны С. саламяныя, на Магілёўшчыне, ва ўсх. частцы Міншчыны — лубяныя; палатняныя бытавалі ў Клімавіцкім і суседніх раёнах. С. выкарыстоўвалі да сярэдзіны 20 ст.

А.Ф.Літвіновіч.

СЯВЕ́РЫКАЎ Валерый Мікалаевіч (18.1.1947, г. Балтыйск Калінінградскай вобл., Расія — 22.7.1997), бел. фізік. Д-р фіз.-матэм. н. (1993). Скончыў БДУ (1969). З 1969 у Ін-це фізікі, з 1993 у Ін-це малекулярнай і атамнай фізікі Нац. АН Беларусі. Навук. працы па нелінейных палярызацыйных з'явах у спектраскапіі і лазернай фізіцы. Распрацаваў тэорыю аптычных рэзанатараў і лазерных сістэм з улікам дынамікі стану палярызацыі выпрамянення, развіў тэорыю стацыянарных і дынамічных палярызацыйных з'яў у газавых лазерах з анізатропнымі рэзанатарамі. Дзярж. прэмія Беларусі 1996.

Тв.: Лазеры с анизотропными резонаторами. Мн., 1988 (разам з А.П.Вайтовічам); Decay rate of the electromagnetic field polarization in a vector laser (разам з А.П.Вайтовічам, А.М.Кульмінскім) // Journal of optics B: Quantum and Semiclassical Optics. 1998. Vol. 10, №1.

СЯВЕ́Ц ЗАЛАЦІ́СТЫ (Pluvialis), род птушак сям. сяўцовых падатр. кулікоў. 3 віды: *тулес*, уласна С.з. (P. apricaria) і С. буракрылы (P. dominica). Пашыраны ў Еўразіі і Паўн. Амерыцы. Гняздуюцца на балотах, у далінах рэк, азёрных катлавінах. С. буракрылы зімуе ў паўд. ч. Паўд. Амерыкі. На Беларусі 2 віды: С.з. і тулес. Рэдкае гнездаванне С.з. адзначана ў паўн. ч. рэспублікі; занесены ў Чырв. кнігу. Пачатак асенняга пралёту птушак супадае з сяўбой азімых (адсюль бел. назва роду).

Даўж. да 30 см, маса да 220 г. Крылы вострыя, хвост невял., прамы або крыху закруглены. Кормяцца дробнымі беспазваночнымі, насеннем і ягадамі раслін. Адкладваюць да 4 яец.

А.М.Петрыкаў.



Сявец залацісты.



Сявенькі.

СЯДЗЕ́ГАЎ Роберт Сяргеевіч (н. 12.5.1934, г. Шуміха Курганскай вобл., Расія), бел. вучоны-эканаміст. Д-р эканам. н. (1978), праф. (1981). Скончыў Ленінградскі караблебуд. ін-т (1957). З 1958 у Чэлябінскім політэхн. ін-це. З 1963 у Цэнтр. н.-д. і праектна-тэхнал. ін-це арганізацыі і тэхнікі кіравання (з 1963 заг. лабараторыі, з 1970 нам. дырэктара), з 1991 заг. кафедры Бел. эканам. ун-та, з 1997 — Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Навук. працы па праблемах удасканальвання сістэм кіравання прадпрыемствамі, арг-цыямі і фірмамі, выкарыстання ў кіраванні вытв-сцю сучасных інфарм. тэхналогій і сродкаў электроннай выліч. тэхнікі. Распрацаваў канцэпцыю інтэграваных аўтаматызаваных сістэм кіравання маш.-буд. і прыборабуд. прадпрыемствамі. Дзярж. прэмія Беларусі 1972. Дзярж. прэмія СССР 1984.

Тв.: Технико-экономическое планирование и учет в АСУ. Мн., 1974 (разам з Б.В.Пашкевічам); Интеграция производственного планирования. М., 1978 (разам з Н.М.Арловай, Ю.І.Сідаравым); Машинная система технико-экономического планирования на предприятии. М., 1982 (разам з Н.М.Арловай, М.І.Чашэнкам); АСУ на промышленном предприятии: Справ. 2 изд. М., 1989 (у сааўт.); Основы менеджмента и маркетинга. Мн., 1995 (у сааўт.); Управление персоналом. Мн., 1997 (разам з М.І.Кабушкіным, В.М.Крыўцовым); Теория системного менеджмента. Мн., 2001 (у сааўт.); Управление персоналом: От фактов настоящего к возможностям будущего. Мн., 2002 (у сааўт).

СЯДЗЕ́НКА Мацвей Васілевіч (19.8.1900, с. Кармавое Рамонтненскага р-на Растоўскай вобл., Расія — 3.9.1977), бел. геолаг. Д-р геолага-мінералагічных н. (1962), праф. (1963). Скончыў Новачаркаскі індустр. ін-т (1934). У 1942—44 дырэктар Геолагаразведачнага ін-та ў Маскве. З 1963 у Бел. ін-це чыг. транспарту. Даследаванні па гідрагеалогіі радовішчаў карысных выкапняў, інж. геалогіі асобных рэгіёнаў Беларусі. Аўтар падручнікаў па інж. геалогіі і гідрагеалогіі.

Тв.: Геология, гидрогеология и инженерная геология. 2 изд. Мн., 1975; Основы гидрогеологии и инженерной геологии. 3 изд. М., 1979.

СЯДЗІ́БА, сялібa, комплекс жылых, гасп., вытв. і інш. будынкаў, якія разам з зямельным надзелам складаюць адзінае гасп.-эканам. і арх.-кампазіцыйнае цэлае. Розныя тыпы С. (сялянскія, рамеснікаў, гандляроў, панскія і інш.) складваліся і развіваліся ў залежнасці ад гіст. і сац.-эканам. умоў і вылучаліся асаблівасцямі планіроўкі і арх. вырашэннямі.

На Беларусі вылучэнне асобных С. на паселішчах, паводле археалогіі, пачалося ў жал. веку. У стараж. Віцебску, Полацку, Мінску, Брэсце і інш. у С. ўваходзілі адна, зрэдку некалькі жылых пабудоў, з хлявамі і майстэрнямі. Тэр. гар. С. абносілі плотам. У склад сялянскіх С. уваходзілі хата і гасп. пабудовы (свіран, варыўня, павець, хлеў, абора, гумно, пуня, асець, лазня і інш.). Паводле планіровачнай арг-цыі вядомы некалькі тыпаў С. Двары-комплексы (на Пн) характарызуюцца цесным спалучэннем, нават перакрыццем агульным дахам жылых і гасп. пабудоў. Вянковы двор (на У, ПнУ) утваралі пабудовы, што стаялі вакол прамавугольнага ў плане двара. Пагонны двор (на З, ПдЗ, у цэнтры) фарміраваўся размяшчэннем пабудоў у адну лінію ў глыбіню двара. Вядомы таксама Г- і П-падобныя, 2-радныя пагонныя і С. з незвязанымі пабудовамі. У гарадах і мястэчках С. сельскага тыпу будавалі на ўскраінах. У цэнтры пераважалі С. рамеснікаў і гандляроў (гл. *Дом рамесніка*), у якія ўваходзілі хаты, крамы, майстэрні, свірны, лямусы і інш. Панскія С. (шляхецкія, магнацкія) вядомы з 11—12 ст. Некат. з іх, у т.л. замкі, сталі пачаткам фарміравання гарадоў і мястэчкаў. Невял. С. складаліся з *сядзібнага дому*, свірна, хлявоў, адрын, гумна і інш. У буйных С. з інтэнсіўнай с.-г. вытворчасцю з 16 — пач. 17 ст. ў арх.-планіровачнай структуры вылучаліся гасп. двор (жылы дом, флігелі, пякарні, скарбніцы і інш.), *фальварак*, гумнішча, аборы, млынава-броварныя комплексы і інш. У загарадных магнацкіх С.-рэзідэнцыях пераважалі жылыя і дапаможныя будынкі, былі «паляўнічыя дамы». Асобны комплекс паблізу іх гасп. часткі стваралі жылыя дамы эканома і работнікаў. У склад некат. С. уваходзілі капліцы, арсеналы, кардэгарды, грыдніцы, гасцініыя дамы, псярні. Пры многіх панскіх С. існавалі сады; з 17 ст. — і т.зв. італьян. сады, якія спалучалі рысы рэгулярнага парку і саду (гл. *Садова-паркавае мастацтва*). З 18 ст. абавязковым элементам панскай С. становіцца парк, напачатку рэгулярнага тыпу, а з 19 ст. — пейзажнага (вёскі Берасценава Аршанскага, Варацэвічы Іванаўскага, Дубай Пінскага р-наў, *Жамыслаўская сядзіба, Кухціцкая сядзіба, Лынтупская сядзіба, Поразаўская сядзіба, Станіславаўская сядзіба, Столінская сядзіба «Манькавічы»*). У гар. панскай С. гал. будынак — сядзібны дом — не меў перад сабой вял. параднага двара-курданёра (гар. С. Ваньковічаў у Мінску, гл. *Мінскія сядзібы Ваньковічаў*), стаяў на «чырвонай» лініі забудовы (Гродна, Брэст, Нясвіж). З 19 ст. пашырылася буд-ва гар. *асабнякоў*. З канца 1920-х г. сялянская С. істотна змянілася пад уплывам працэсаў калектывізацыі. Многія гасп. пабудовы выйшлі з ужытку, паменшыліся памеры гасп. будынкаў, пачалі знікаць С. вянковыя і двары-комплексы. Найб. пашыраны тып С. — з нязвязанымі пабудовамі. Больш свабоднае размяшчэнне пабудоў дазволіла палепшыць сан.-гігіенічныя ўмовы, павялічыць памеры садоў і кветнікаў, увесці ў архітэктуру С. такія элементы, як ганкі, веранды, альтанкі. Сац.-эканам. змены ў 2-й пал. 20 ст. адзначаны павелічэннем плошчаў зямельных надзелаў С., буд-вам гаражоў, некат. вытв. будынкаў, лазняў і інш. У сучаснай сельскай архітэктуры С. наз. таксама вытв. і грамадска-адм. цэнтры калгасаў, саўгасаў і інш. Яны функцыянальна падзяляюцца на сялібныя, гасп. і вытв. зоны (вёскі *Аснежыцы, Верцялішкі, Мышкавічы*, пас. *Жамчужны*). Лепшыя прыклады цэнтр. С. вызначаюцца ансамблевасцю забудовы, добраўпарадкаваннем і інж. абсталяваннем. Пры стварэнні С. улічваюцца спецыфіка вясковага жыцця, мясц. традыцыі і асаблівасці. У 1990-я г. з'явіліся фермерскія С., прызначаныя для гаспадаркі, якая мае ўласныя сродкі вытворчасці, у якой заняты ўсе члены сям'і. На фарміраванне такой С. ўплывае спецыялізацыя вытворчасці (утрыманне буйной рагатай жывёлы, птушкагадоўля, раслінаводства і інш.), наяўнасць дарог, асаблівасці рэльефу і



Да арт. **Сядзіба**. Сядзібная забудова ў вёсцы Берасценава Аршанскага раёна Віцебскай вобл. З малюнка Н.Орды. 1877.



Сядзіба ў вёсцы Варацэвічы Іванаўскага раёна Брэсцкай вобл. З літаграфіі паводле малюнка Н.Орды. 1879.

г.д. Традыц. формы С. захаваліся ў забудове гар. пасёлкаў і гарадоў, што надае ім непаўторнае маст. аблічча. Гл. таксама *Народнае дойлідства, Сельская архітэктура.*

Літ.: Кулагин А.Н. Архитектура дворцово-усадебных ансамблей Белоруссии: Вторая половина XVIII — начало XIX в. Мн., 1981; Локотко А.И. Белорусское народное зодчество: Середина XIX—XX в. Мн., 1991; Сергачев С.А. Белорусское народное зодчество. Мн., 1992. *С.А.Сергачоў.*

СЯДЗІ́БНЫ ДОМ, 1) жылы будынак у панскай сядзібе, які адрозніваўся ад *палаца* меншымі памерамі і колькасцю памяшканняў, больш простым арх.-маст. вырашэннем фасадаў і інтэр'ераў; арх.-планіровачны цэнтр *сядзібы.* Вядомы на тэр. Беларусі, Літвы, Польшчы, Расіі і інш. у 16 — пач. 20 ст. Будавалі пераважна ў сельскай мясцовасці, у гарадах і мястэчках найчасцей былі зімовым жыллём сям'і пана. Першапачаткова — драўляныя будынкі, выкананыя ў традыцыях нар. дойлідства на ўзор 2- і 3-камерных сял. хат, але мелі печ з комінам, шкляныя вокны, ганак. З 17 ст. пашырылася буд-ва мураваных С.д. (напр., у в. Гайцюнішкі Воранаўскага р-на). Развіццё планіроўкі С.д. садзейнічала дыферэнцыяцыі памяшканняў паводле іх функцыян. прызначэння, вылучэнню *алькежаў, флігеляў.* Часцей выкарыстоўвалася анфіладная планіроўка, сім. кампазіцыя аб'ёмаў. Цэнтр. ч. дома вылучалася адкрытым слупавым (нагадвала сваімі формамі каланаду) ці закрытым ганкам, мезанінам, балконам (напр., у вёсках Відзы Лаўчынскія Браслаўскага, Кашубінцы, г. Навагрудак Гродзенскага р-наў). Архітэктура правінцыяльных С.д. спалучала прынцыпы вядучых маст. стыляў з традыцыямі мясц. дойлідства. З 18 ст. С.д. атрымалі выразныя барочныя сілуэтныя кампазіцыі, складаныя формы дахаў (ламаныя, мансардавыя), якія дапаўняліся аб'ёмамі прыбудаваных алькежаў з шатровымі дахамі (г.п. Копысь Аршанскага р-на). З канца 18 ст. пашырыліся класіцыстычныя кампазіцыі, засн. на вылучэнні гал. фасада і ўвахода (гарады Ваўкавыск, Кобрын, в. Янавічы Клецкага р-на). У 2-й пал. 19 — пач. 20 ст. часта выкарыстоўваліся прыёмы эклектыкі (*Чырвонабярэжская сядзіба, Краскаўская сядзіба*). 2) У сучаснай забудове населеных пунктаў — жылы дом, разлічаны на адну сям'ю. Сваёй планіроўкай і аб'ёмнай кампазіцыяй звязаны з тэр. сядзібы і з'яўляецца ч. ансамбля вуліцы, групы дамоў, квартала (в. Мышкавічы Кіраўскага р-на, арх. Т.Галіёта). Пры ўзвядзенні выкарыстоўваюцца тыпавыя праекты дамоў (1- і 2-павярховыя, мансардавыя, з цокальным паверхам).

Літ.: Кулагин А.Н. Архитектура дворцово-усадебных ансамблей Белоруссии: Вторая половина XVIII — начало XIX в. Мн., 1981; Чантурия В.А. История архитектуры Белоруссии. Т. 1. 3 изд. Мн., 1985; Сергачев С.А. Белорусское народное зодчество. Мн., 1992. *С.А.Сергачоў.*

СЯДЛЕ́ЦКАЕ ВАЯВО́ДСТВА (Województwo Siedleckie), былая адм.-тэр. адзінка на У Польшчы. З 1999 у складзе *Мазавецкага ваяводства.*

СЯДНЁЎ Масей (Майсей) Ларывонавіч (1.9.1913, в. Мокрае Касцюковіцкага р-на Магілёўскай вобл. — 4.2.2001), бел. пісьменнік. Вучыўся ў Мсціслаўскім педтэхнікуме (1930—31), Мінскім вышэйшым пед. ін-це (1933—36). У 1936 арыштаваны, 4 гады адбыў у лагеры на Калыме. У 1940 прывезены ў Мінск на перагляд справы. На пачатку вайны апынуўся на волі. З 1943 за мяжою. Быў настаўнікам бел. гімназіі ў Міхельсдорфе (Германія). З 1950 у ЗША. Выкладаў рус. мову ва ун-це штата Індыяна. Жыў у г. Глен-Коў. Рэабілітаваны ў 1992. Друкаваўся з 1932. Перажытае ў турмах і лагерах, успаміны пра свабоду і няволю, туга па радзіме, вайна і чужына, філасафічнасць, лірызм у зб-ках паэзіі «У акіяне ночы», «На край святла», «Спадзяванні», «Цень Янкі Купалы» (усе 1947), «Ля ціхай брамы» (1955), «Патушаныя зоры» (1975), «Ачышчэнне агнём» (1985), «А часу больш, чым вечнасць» (1989). Аўтар раманаў «Раман Корзюк» (1985), «І той дзень надышоў» (1987), успамінаў, у т.л. пра Я.Купалу і Я.Коласа. На бел. мову пераклаў санеты Мікеланджэла, некат. творы І.В.Гётэ, Г.Гейнэ, Р.М.Рыльке і інш. С. прататып сына Дзяніса Зазыбы ў рамане І.Чыгрынава «Плач перапёлкі».

Тв.: Патушаныя зоры: Вершы, раман. Мн., 1992; Масеева кніга. Мн., 1994.

Літ.: Савік Л. «Я прыйду з далёкае чужыны...»: Масей Сядзёў // Савік Л. Пакліканыя: Літ. бел. замежжа. Мн., 2001.
І.У.Саламевіч.

СЯДО́Ў Валянцін Васілевіч (н. 21.11.1924, г. Нагінск Маскоўскай вобл., Расія), расійскі археолаг. Чл.-кар. Рас. АН (1997), ганаровы акад. Лат. АН (1994). Д-р гіст. н. (1970), праф. (1986). Скончыў Маскоўскі ун-т (1951). З 1954 у Ін-це археалогіі АН СССР (цяпер Рас. АН). Даследуе археалогію і культуру Стараж. Русі, этнагенез славян, этнічную гісторыю балтаў і фіна-уграў. У 1960-я г. правёў разведкі і раскопкі курганоў у Бел. Панямонні. Стварыў тэорыю субстратнага паходжання беларусаў. Вынікамі ўздзеяння балцкага субстрату тлумачыць вытокі асаблівасцей бел. лінгваэтнічнай супольнасці, якая, на яго думку, афармілася ў 8—12 ст., да пачатку адасаблення беларусаў. Аўтар арт. «Да паходжання беларусаў» (1967), «Этнагенез і станаўленне беларусаў» (2000), манаграфій «Славяне Верхняга Падняпроўя і Падзвіння» (1970), «Доўгія курганы крывічоў» (1974), «Паходжанне і ранняя гісторыя славян» (1979), «Усходнія славяне ў VI—XIII стст.» (1982), «Старажытнаруская народнасць» (1999) і інш. Дзярж. прэмія СССР 1984, Дзярж. прэмія Расіі 1998.

Літ.: В.В.Седов: Биобиблиогр. указ. М., 1999. *Р.В.Штыхаў.*

СЯДО́Ў Георгій Якаўлевіч (5.5.1877, с. Крывая Каса, цяпер г.п. Сядова Данецкай вобл., Украіна — 5.3.1914), расійскі гідраграф і палярны даследчык. Скончыў мараходнае вучылішча ў Растове-на-Доне (1898), Марскі корпус у Пецярбургу (1901). У 1902 удзельнічаў у гідраграфічных даследаваннях у Паўн. Ледавітым ак. У 1909 кіраваў экспедыцыяй, якая даследавала вусце р. Калыма, у 1910 — Крыжовую губу (каля Новай Зямлі). У 1912 арганізаваў экспедыцыю да Паўн. полюса на судне «Св. Фока» (з 2 зімоўкамі). 15.2.1914 накіраваўся на сабаках да Паўн. полюса. Памёр па дарозе, каля в-ва Рудольфа (архіпелаг Зямлі Франца-Іосіфа), дзе і пахаваны. Экспедыцыя правяла акіянаграфічныя, метэаралагічныя і магн. даследаванні, склала карту паўн.-зах.



Сядзібны дом у г. Навагрудак Гродзенскай вобл. З гравюры 1862.



Сядзібны дом у вёсцы Відзы Лаўчынскія Браслаўскага раёна Віцебскай вобл.

ўзбярэжжа Новай Зямлі. Яго імем названы гар. пасёлак на Украіне, мыс у Антарктыдзе, пік і заліў на Новай Зямлі, архіпелаг каля Паўн. Зямлі.

СЯДО́Ў Леанід Іванавіч (14.11.1907, г. Растоў-на-Доне, Расія — 5.9.1999), расійскі вучоны ў галіне механікі і прыкладной матэматыкі. Акад. Рас. АН (1953, чл.-кар. 1946). Герой Сац. Працы (1967). Замежны чл. АН Францыі (1978). Ганаровы чл. Амер. акадэміі мастацтваў і навук (1960) і інш. акадэмій. Скончыў Маскоўскі ун-т (1930). З 1932 у Цэнтр. аэрагідрадынамічным ін-це, у 1948—56 у Цэнтр. ін-це авіяматорабудавання, адначасова з 1937 у Маскоўскім ун-це (з 1951 заг. кафедры), з 1945 у Матэм. ін-це АН СССР. Навук. працы па гідра- і аэрамеханіцы, механіцы суцэльнага асяроддзя, газадынаміцы, астрафізіцы, тэорыі падобнасці і інш. Распрацаваў тэорыі ўдару цел аб ваду, глісіравання і інш., агульную тэорыю аўтамадэльных рухаў суцэльных асяроддзяў. Даў дакладнае рашэнне задачы аб магутным выбуху. Атрымаў важныя вынікі ў тэорыях турбулентных рухаў вадкасці і газу, гарэння і дэтанацыі, будовы зорак і інш. Дзярж. прэмія СССР 1952.

Тв.: Плоские задачи гидродинамики и аэродинамики. 3 изд. М., 1980; Методы подобия и размерности в механике. 10 изд. М., 1987; Основы макроскопических теорий гравитации и электромагнетизма. М., 1989 (разам з А.Г.Цыпкіным); Об основных моделях в механике. М., 1992; Механика сплошной среды. Т. 1—2. 5 изд. М., 1994.

Літ.: Л.И.Седов // Вестн. Моск. ун-та. Сер. 1. Математика. Механика. 1997. №6.

М.М.Касцюковіч.

СЯДЫ́Х Канстанцін Фёдаравіч (21.1.1908, пас. Папярэчны Зерэнтуй Чыцінскай вобл., Расія — 21.11.1979), рускі пісьменнік. Вучыўся ў Чыцінскім пед. тэхнікуме. Друкаваўся з 1924. Першая кн. вершаў «Забайкалле» (1933). У паэт. зб-ках «Сэрца» (1934), «Вершы» (1936), «Родны стэп» (1937), «Над стэпам сонца» (1948), «Стэпавыя макі» (1969) і інш. мінулае і будучыня, людзі і прырода Сібіры. Раманы «Даурыя» (кн. 1—2, 1942—48; Дзярж. прэмія СССР 1950) і «Бацькоўскі край» (1958; на аснове раманаў зняты фільм «Даурыя») пра жыццё сібірскага казацтва, грамадз. вайну.

Тв.: Даурия: Роман. Л., 1989.

Літ.: Войлошников П.А. Константин Седых. Абакан, 1959.

СЯКЕ́РА (ад слав. сікіра, сакіра), універсальная традыц. прылада для апрацоўкі дрэва і інш. матэрыялаў; шырокі прадаўгаваты металічны клін з лязом і абухом, насаджаны на тапарышча. Выкарыстоўвалася і як зброя.

Прымітыўная крамянёвая прылада, вядома з палеаліту (выраблялі з граніту, дыярыту і інш.). Груба абабітыя авальныя або трапецападобныя С. з'явіліся ў мезаліце. У неаліце С. набыла больш дасканалыя формы, яе лязо зашліхтоўвалася. У бронзавым веку пашыраны каменныя свідраваныя С. (выкарыстоўваліся як зброя і для выканання рытуалаў) і С.-кліны, якімі апрацоўвалі дрэва; рабілі іх і з бронзы. У жалезным веку ўжываліся каменныя, бронзавыя і жалезныя С. У 1-м тыс. н.э. ў зах. частцы Беларусі былі пашыраны баявыя вузкалязовыя С. (іх найчасцей знаходзяць у курганах усходне-літ. тыпу). С. як зброю славяне пачалі выкарыстоўваць у 7—8 ст. (баявыя С. знаходзяць у раннесярэдневяковых пахаваннях і на гарадзішчах). С. баявога прызначэння былі *чаканы*, але колькасна пераважалі лопасцевыя ўзоры С. з лязом, моцна адцягнутым да тронка, і шчакавіцамі на абушку. У 11—12 ст. баявыя С. мелі па 2 пары бакавых шчакавіц і зрэзанае вастрыё ляза, што дазваляла рабіць сякучае і рэжучае дзеянне. У 14—15 ст. ў зах. Беларусі пашыраны шырокалязовыя С., больш масіўныя і без шчакавіц. Маса С. павялічылася ў 15—16 ст., калі яны страцілі ролю зброі. З 17 ст. формы С. наблізіліся да сучасных. Тыповая баявая С. была з шырокім лязом у форме паўмесяца і абухом для насадкі на тапарышча. Часам на абуху знаходзіўся кручок, якім пехацінцы сцягвалі кавалерыстаў з коней. У Зах. Еўропе да 16 ст. С. выцеснена *алебардай*, у Расіі *бердышом*. У адрозненне ад алебарды С. была без кап'я, карацейшая за бярдыш, мела разнастайныя формы ляза. Жалезныя С. 11—13 ст. знойдзены ў Браславе, Ваўкавыску, Заслаўі, Лагойску, Лукомлі, Мінску і інш., узоры 15—17 ст. — у Брэсце, Віцебску, Мінску, Лідскім і Мірскім замках і інш.

Літ.: Казакявичюс В.К. Оружие балтских племен II—VIII вв. на территории Литвы. Вильнюс, 1988.



Да арт. **Сякера**. Сякеры-кліны: каменныя (1, 5), крамянёвыя (2, 4, 7), цёслы (3, 6), 2—1,5 тыс. г. да н.э. Жалезныя сякеры: з гарадзішча Старое Краснае Рэчыцкага раёна (8), 6 ст. да н.э.; баявая сякера (9).

СЯКЕ́РАЎШЧЫНА, радовішча глін у Полацкім р-не Віцебскай вобл., каля вёсак Сякераўшчына, Скавародзіна і Янкава. Пластавы паклад звязаны з азёрна-ледавіковымі адкладамі паазерскага зледзянення. Складаецца з 3 участкаў: Паўн., Цэнтр. і Паўднёвага. Гліны чырвонабурыя, шакаладныя, стужачныя, тлустыя, шчыльныя, з праслойкамі і лінзамі пяску, пластычныя, дысперсныя, гідраслюдзіста-каалінітавага і гідраслюдзіста-мантмарыланітавага складу. Разведаныя запасы — 10,3 млн. м^3, перспектыўныя — 6,6 млн. м^3. Магутнасць карыснай тоўшчы 2,6—14 м, ускрышы (пяскі, супескі, суглінкі, торф) 0,2—7,1 м. Гліны прыдатныя для вытв-сці цэглы і дрэнажных труб. *А.П.Шчураў.*



Л.І.**Сядоў**.



М.А.**Сяліцкі**.

СЯКЕ́РЫЧЫ, вёска ў Зубкаўскім с/с Клецкага р-на Мінскай вобл. Цэнтр с.-г. вытв. кааператыва-агракамбіната. За 4 км на ПнУ ад горада і чыг. ст. Клецк, 131 км ад Мінска. 653 ж., 230 двароў (2002). Дом культуры, б-ка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

СЯЛЕ́Ц, вёска ў Бярозаўскім р-не Брэсцкай вобл., каля р. Ясельда і аднайм. вадасховішча, на аўтадарозе, якая злучае вёску з г. Бяроза. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 12 км ад горада і чыг. ст. Бяроза, 111 км ад Брэста. 1023 ж., 397 двароў (2002). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, амбулаторыя, аптэка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў. Помнікі архітэктуры: *Сялецкая Успенская царква*, касцёл св. Аляксея (1912).

СЯЛЕ́Ц, вёска ў Мсціслаўскім р-не Магілёўскай вобл., каля р. Сож, на аўтадарозе Мсціслаў—Крычаў. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 16 км на Пд ад г. Мсціслаў, 111 км ад Магілёва, 16 км ад чыг. ст. Крычаў. 596 ж., 275 двароў (2002). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Помнікі архітэктуры: вадзяны млын (сярэдзіна 20 ст.), Свята-Ануфрыеўская царква (2-я пал. 18 ст.).

СЯЛЕ́Ц, вадасховішча ў Бярозаўскім р-не Брэсцкай вобл., каля в. Сялец. Створана ў 1985 у пойме р. Ясельда. Пл. 20,7 км^2, даўж. 11,8 км, найб. шыр. 4,1 км, найб. глыб. 5,4 м, аб'ём вады 56,3 млн. м^3. Даўж. берагавой лініі 33,5 км. Сярэдні шматгадовы сцёк 101 млн. м^3. Катлавіна выцягнута з ПнЗ на ПдУ. Земляная намыўная плаціна даўж. 4,3 км з хвалеўстойлівым верхавым адхонам, даўж. агараджальнай дамбы 13,9 км. Ваганні ўзроўню вады на працягу года 2,5 м. Выкарыстоўваецца для рыбаводства,

увільгатнення с.-г. угоддзяў, добраўпарадкавання прылеглых населеных пунктаў, адпачынку.

СЯЛЕ́ЦКАЕ, вёска ў Касцюковіцкім р-не Магілёўскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 32 км на ПдУ ад г. Касцюковічы, 192 км ад Магілёва, 4 км ад чыг. ст. Журбін. 789 ж., 270 двароў (2002). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

СЯЛЕ́ЦКАЯ УСПЕ́НСКАЯ ЦАРКВА́, помнік архітэктуры 19 ст. ў в. Сялец Бярозаўскага р-на Брэсцкай вобл. Пабудавана ў 1870 з цэглы. У плане — выцягнутая па падоўжнай восі кампазіцыя, што ўключае званіцу, трапезную, асн. аб'ём з бакавымі парталамі, 5-гранную апсіду, да якой прымыкаюць дзяканнік і ахвярнік. Арх.-дэкар. аздабленне засн. на спалучэнні традыцый класіцызму (апрацоўка сцен пілястрамі тасканскага ордэра, прафіляваныя высокія карнізы, абрамленні паўкруглых аконных праёмаў асн. аб'ёму) і характэрных форм маскоўскай архітэктуры 17 ст. (канстр. схема званіцы — васьмярык на чацверыку, шатровы дах з цыбулепадобнай галоўкай, кілепадобныя какошнікі парталаў і вежы-званіцы).

Г.А.Лаўрэцкі.



Сялецкая Успенская царква.

СЯЛІ́БА, тое, што *сядзіба*.

СЯЛІ́БА, вёска ў Бярэзінскім р-не Мінскай вобл., на р. Бярэзіна (бас. р. Дняпро). Цэнтр сельсавета і калгаса. За 35 км на Пд ад г. Беразіно, 136 км ад Мінска, 25 км ад чыг. ст. Нясета. 391 ж., 145 двароў (2002). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

СЯЛІ́ЦКІ Мікалай Аляксандравіч (5.4.1907, Мінск — 29.10.1936), Герой Сав. Саюза (1936). Скончыў Арлоўскую бранятанк. школу (1932). У Чырв. Арміі з 1931. Танк. ўзвод на чале з лейтэнантам С. вызначыўся ў вайну ў Іспаніі 1936—39 у баі каля г. Сесенья 29.10.1936, дзе ў цяжкіх умовах атакаваў артылерыю праціўніка на пазіцыях і яго рэзервы на падыходзе, знішчыў батарэю горных гармат; загінуў у баі.

СЯЛІ́ЦКІ (Sielicki) Францішак (29.11.1923, в. Мікуліна Вілейскага р-на Мінскай вобл. — 2.9.2001), польскі літ.-знавец-славіст, фальклярыст. Д-р філал. н. (1966). Скончыў Вроцлаўскі ун-т (1955), з 1978 праф. Ін-та слав. філалогіі гэтага ун-та. Аўтар кніг «Аповесць мінулых гадоў»: Гістарычна-літаратурная характарыстыка, пераклад і каментарый» (1968), «Максім Горкі сярод польскіх спраў» (1971), «Падарожжа баярына Барыса Шарамецева праз Польшчу і Аўстрыю ў Рым, а таксама на Мальту, 1697—1698» (1975). Даследаваў рус. класіку (творы І.Тургенева, Л.Талстога, Ф.Дастаеўскага, А.Чэхава). Выдаў падручнік «Беларускі фальклор» (1983). Аўтар прац «Беларускія вясельныя абрады і песні з вёскі Мікуліна...» (1979), «Беларускія жартоўныя песні і вершы з ваколіц вёскі Мікуліна» (1980), «Пахавальныя і дзядоўскія песні, якія выконваліся ў б. Вілейскім павеце», «Відовішчы ў вёсцы Мікуліна б. Вілейскага павета ў міжваенны перыяд» (абедзве 1982). Арт. «Францыск Скарына ў польскай навуцы» (1990) прысвечаны скарыназнаўству ў Польшчы.

Тв.: Region dołhinowsko-budsławsko-krzywicki na dawnej Wileńszczyźnie. Warszawa; Wrocław, 1989; Krzyż w wierzeniach ludu Wilejszczyźny // Nasz radawod. Grodna, 1991. Кн. 3, ч. 3; Pieśni białoruskie i rosyjskie śpiewane na Wileńszczyźnie w okresie międzywojennym. Wrocław, 1992; Podania, legendy, anekdoty i przysłowia na Wilejszczyźnie w okresie międzywojennym. Wrocław, 1993.

А.В.Мальдзіс.

СЯЛО́, тып сельскага паселішча ва ўсх. славян. Тэрмін ужываецца таксама ў палякаў, балгар і інш. У Стараж. Русі С. складалася з 3—5 двароў, на Беларусі ў 14—15 ст. — з *дымоў* (двароў), або *дварышчаў*, якія ядналі 5—10 і болей сваяцкіх сем'яў. Пасля *«Уставы на валокі» 1557* С. часта ўзнікалі на новых месцах; туды ссяляліся (асаджваліся) прыгонныя сяляне, якія выконвалі пераважна чыншавыя, падатковыя павіннасці (асадныя С.). Каля цэнтраў *фальваркаў* узнікалі дворныя С. найчасцей з колішняй чэлядзі, па 10—12 двароў. У сярэдзіне 17 ст. былі С. па 60 двароў і болей; на Беларусі яны сталі называцца таксама вёскамі, ад якіх амаль не адрозніваліся (гл. *Вёска*). У дарэв. Расіі С. наз. вялікае сялянскае паселішча з царквою, крамаю, карчмою і інш.

А.П.Грыцкевіч.

СЯЛЬВІ́НСКІ Ілья (Карл) Львовіч (24.10.1899, г. Сімферопаль, Украіна, — 22.3.1968), рускі пісьменнік. Скончыў Маскоўскі ун-т (1923). Друкаваўся з 1915. У 1920-х г. адзін з лідэраў *канструктывізму* (паэмы «Улялаеўшчына», 1927, новы варыянт 1956; «Нататкі паэта», 1927). Раннія творы адметныя эксперыментатарствам у галіне паэт. формы і мовы. У 1933 як карэспандэнт «Правды» ўдзельнічаў у паходзе «Чэлюскіна» (паэма «Чэлюскініяна», часткова апубл. 1937—38; перапрацавана ў раман «Арктыка», апубл. 1957). У трагедыі «Камандарм-2» (паст. 1929 У.Меерхольдам), рамане ў вершах «Пушторг» (1928) тэмы грамадз. вайны, нэпа. У 1930-я г. распрацоўваў жанр гіст. трагедыі ў вершах («Рыцар Іаан», 1937; «Бабек», 1941; трылогія «Расія», 1944—57). Аўтар аўтабіягр. рамана «О, юнацтва маё!» (1966), п'есы «Умка — Белы Мядзведзь» (1933), лірычнай трагедыі «Царэўна-Лебедзь» (апубл. 1968), кн. «Студыя верша» (1962) і інш.

Тв.: Собр. соч. Т. 1—6. М., 1971—74; Избр. произв. Т. 1—2. М., 1989; Театр поэта. М., 1965.

Літ.: Резник О. Жизнь в поэзии: Творчество Ильи Сельвинского. 3 изд. М., 1981; О Сельвинском: Воспоминания. М., 1982.

СЯЛЯ́ВА, возера ў Крупскім р-не Мінскай вобл., у бас. р. Лукомка, за 20 км на Пн ад г. Крупкі. Пл. 15 км², даўж. 15 км,



найб. шыр. 3 км, найб. глыб. 19,5 м, даўж. берагавой лініі 44,3 км, пл. водазбору 324 км². Катлавіна лагчыннага тыпу, складаецца з вузкага паўд. і шырокага паўн. плёсаў. Схілы выш. 6—8 м (на Пн 3—5 м), пераважна парослыя лесам. Берагі нізкія, пясчаныя, месцамі

забалочаныя, на Пд зліваюцца са схіламі. Дно да глыб. 4—6 м (месцамі да 10 м) выслана пясчана-галечнымі і апясчанеными адкладамі, глыбей сапрапелямі. У паўн. плёсе 3 астравы, найб. з іх пл. каля 2 км^2. Мінералізацыя вады каля 200 мг/л, празрыстасць да 3 м. Эўтрофнае. Зарастае слаба. Уздоўж берагоў вузкая, перарывістая паласа з асок, чароту, трыснягу, хвашчу. Упадаюць рэкі Высокая і Ракітаўка, 5 ручаёў, на Пн злучана шырокай пратокай з воз. Абіда. Узровень возера штучна падняты на 2—3 м плацінай б. Сяляўскай ГЭС.

СЯЛЯ́ВА, рыба сям. сіговых, гл. *Рапушкі*.

СЯЛЯ́ВА, ландшафтны заказнік рэсп. значэння ў Крупскім р-не Мінскай вобл. і Чашніцкім р-не Віцебскай вобл. Засн. ў 1993 для аховы унікальнага ландшафтна-азёрнага комплексу з папуляцыямі рэдкіх і знікаючых відаў раслін і жывёл. Пл. 19 261 га, уключае азёры *Сялява*, Абіда, Худава, Болюцкае, Квеціна, прылеглыя лясы і с.-г. ўгоддзі. Рэльеф буйна- і дробнаўзгорысты з хваліста-марэнна-азёрнымі ландшафтамі Бел. Паазер'я. У флоры 578 відаў вышэйшых сасудзістых раслін, 27 водарасцей, у т.л. 11 рэдкіх і знікаючых відаў, занесеных у Чырв. кнігу: купальнік горны, баранец звычайны, гайнік цёмначырвоны, пярэсна еўрапейская, шпажнік чарапіцавы і інш. Шмат лек., дэкар., кармавых відаў. У фауне 40 відаў млекакормячых, 142 — птушак, 10 — амфібій, 5 — рэптылій, у т.л. ў Чырв. кнізе 20 відаў: соня арэшнікавая, барсук, мядзведзь буры, скапа, змееяд вялікі, падворлік малы, паганка малая, бугай вялікі і малы, каршачок, дзербнік, пустальга звычайная. У азёрах прамысловымі з'яўляюцца лешч, шчупак, сом, язь, судак, плотка, гусцяра. *П.І.Лабанок.*

СЯЛЯ́ВА Антоній (свецкае імя Анастасій; каля 1583, Полацкае ваяв. — 1655), уніяцкі царк. дзеяч Рэчы Паспалітай, пісьменнік-палеміст. З 1612 чл. ордэна базыльян, у 1617 пасвячоны ў святары. Скончыў Грэчаскі калегіум у Рыме (1622). З 1622 архімандрыт уніяцкіх манастыроў: у Вільні св. Тройцы, Навагрудку, Жыдзічыне. З 1624 архіепіскап полацкі, з 1639 ген. вікарый Кіеўскай мітраполіі. У 1641—55 мітрапаліт кіеўскі і галіцкі, адначасова з 1652 генерал (протаархімандрыт) базыльянскага ордэна. У 1630—40-я г. ўдзельнічаў у падрыхтоўцы агульнага сабора уніятаў і праваслаўных з мэтай аб'яднання на падставе стварэння Кіеўскага патрыярхата і прызнання вяршэнства папы. Клапаціўся пра адукацыю святароў, умацаванне манастырскага жыцця, адкрыў семінарыю пры Мінскім базыльянскім манастыры (1652). Папулярызаваў культ І.*Кунцэвіча*. Аўтар «Антыэленхуса» (1622) — адказу на «Эленхус» М.Сматрыцкага (1622) і жыццяпіса Кунцэвіча (1625).

Літ.: Белоруссия в эпоху феодализма. Т. 1. Мн., 1959; Уния в документах. Мн., 1997; Коялович М. Литовская церковная уния. Т. 2. СПб., 1861. *С.В.Казуля.*

СЯЛЯ́ВІЧЫ, вёска ў Слонімскім р-не Гродзенскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 24 км на ПдЗ ад г. Слонім, 150 км ад Гродна, 7 км ад чыг. ст. Азярніца. 485 ж., 182 двары (2002). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан. Помнік архітэктуры — касцёл св. Барбары (1819).

СЯЛЯ́ЕВА, возера ў Віцебскім р-не, у бас. р. Зах. Дзвіна, за 28 км на ПнУ ад г. Віцебск. Пл. 0,32 км^2, даўж. 1,1 км, найб. шыр. 450 м, даўжыня берагавой лініі 2,6 км. Схілы катлавіны выш. 3—4 м, пад лесам. На З вышэйшае ручай у р. Зах. Дзвіна.

СЯЛЯ́НЕ-ДА́ННІКІ, гл. ў арт. *Даннікі*.

СЯЛЯ́НЕ-СЛУ́ГІ, гл. ў арт. *Слугі*.

СЯЛЯ́НСКАЕ ПАЎСТА́ННЕ 1893—94 у Карэі [у карэйскай гістарыяграфіі Сялянская вайна года Кабо (1894)], адно з найбуйнейшых антыфеад. і антыкаланіяльных выступленняў кар. народа. Гал. яго прычынай стала пагаршэнне становішча насельніцтва (найперш сялянства) пасля нераўнапраўнага японска-кар. Канхваскага дагавора 1876, у выніку якога Карэя абавязана была выплачваць кантрыбуцыі Японіі. Зімой і вясной 1893 сял. выступленні ахапілі паўд. і цэнтр. паветы, але былі задушаны. У студз. 1894 паўстанне аднавілася і набыло арганізаваныя рысы. Да канца мая 1894 паўстанцкая армія заняла 9 паветаў і г. Чанджу. Паўстанцы патрабавалі ад урада раўнамернага размеркавання зямлі і рэформы мясц. самакіравання. У чэрв. 1894 урад звярнуўся па дапамогу да Кітая, які накіраваў у Карэю свае войскі. Японія, выкарыстаўшы гэта як зачэпку, ажыццявіла ў ліп. 1894 у Карэі дзярж. пераварот, паставіла праяпонскі кабінет і развязала *японска-кітайскую вайну 1894—95*. Гэта ўзмацніла нац.-вызв. рух, да паўстанцаў-сялян далучыліся рамеснікі, гандляры, салдаты, чыноўнікі, збяднелыя дваране і інш. Пасля шэрагу перамог на шляху да Сеула паўстанцкая армія ў ліст.—снеж. 1894 пацярпела паражэнне ад яп. і ўрадавых войск. Разгром паўстання і перамога ў яп.-кіт. вайне аблегчылі Японіі далейшае закабаленне Карэі (пратэктарат у 1905, анексія ў 1910).

Літ.: Тягай Г.Д. Крестьянское восстание в Корее, 1893—1895. М., 1953. *Ю.В.Бажэнаў.*

СЯЛЯ́НСКАЯ ВАЙНА́ 1524—26, найбуйнейшае антыфеад. выступленне сялян (падтрымана асобнымі гарадамі і рыцарамі) у сярэдневяковай Германіі, у частцы Аўстрыі і Швейцарыі. Была працягам шматлікіх сял. хваляванняў з 14 ст. (рух Г.*Бёгайма*, змова «*Башмака*» і інш.). Праходзіла ва ўмовах рэліг. *Рэфармацыі*. Выклікана эканам., сац. і паліт. прычынамі (уціск сялян землеўласнікамі, падатковы прыгнёт, у т. л. царк. дзесяціна, і інш.). Пачалася ў чэрв. 1524 з паўстання на Пд Германіі (ландграфства Шюлінген). Пад уплывам прапаганды Т.*Мюнцэра* і *анабаптыстаў* паўстанне набыло арганізаваны характар. З пач. 1525 яно ахапіла Верхнюю Швабію і Франконію. У крас. 1525 паўсталі сяляне ў Цюрынгіі, у маі — у Ціролі. Лідэрамі паўстанцаў былі Мюнцэр, Ф.*Гер*, М.*Гайсмайр* і інш. У раёнах сял. паўстанняў дзейнічалі буйныя атрады колькасцю да некалькіх тыс. чал., яны авалодалі шэрагам замкаў. Былі распрацаваны некалькі утапічных праграмных дакументаў паўстанцаў («Артыкульнае пісьмо», «12 артыкулаў», «Гейльбранская праграма» і інш.), якія з пазіцый «боскага права» адлюстроўвалі ідэю сац. справядлівасці. Многія вёскі і цэлыя мясцовасці адмаўляліся ад выканання феад. павіннасцей і патрабавалі ад сваіх землеўласнікаў іх ліквідацыі. Але разрозненасць асн. цэнтраў паўстанняў і іх слабая падтрымка бюргерствам аблегчылі задушэнне сял. вайны сіламі Швабскага саюза і інш. рыцарскіх войск. Апошнімі супраціўляліся паў-



У заказніку возера **Сялява**.

станцы ў Ціролі, Карынтыі, Штырыі, Крайне (да лета 1526). Паражэнне С.в. не прывяло да істотных змен у становішчы сялянства ў Германіі, але вайна засведчыла вял. сац. актыўнасць сял. саслоўя. Рэхам С.в. была *Мюнстэрская камуна* (1534—35).

У марксісцкай гістарыяграфіі С.в. 1524—26 разглядаецца як кульмінацыя раннебурж. рэвалюцыі перыяду Рэфармацыі.

Літ.: Ивонин Ю.Е. «Вся власть должна быть отдана простому народу» // И живы памятью столетий: Очерки о вождях нар. движений в средневековой Европе. Мн., 1987; Blickle P. Die Revolution von 1525. München, 1993.

СЯЛЯ́НСКАЯ ВАЙНА́ 1628—45 у Кітаі, народнае паўстанне ў Кітаі ў 1-й пал. 17 ст., якое скінула дынастыю *Мін*. Выклікана ростам жабрацтва шырокіх сял. мас з-за недахопу ворных зямель, цяжкіх падаткаў і карупцыі чыноўніцтва. Пачалося ў 1628 у правінцыях Шэньсі і Хубэй; неўзабаве ўзнік агач паўстання і ў прав. Сычуань, які ўзначаліў Чжан Сяньчжун; абодва яны дзейнічалі паасобку. Кіруючыся канфуцыянскімі ідэямі сац. справядлівасці і роўнасці, паўстанцы знішчалі буйных землеўладальнікаў, чыноўнікаў і ліхвяроў, размяркоўваючы іх маёмасць сярод беднаты. Урадавыя войскі да 1638 разгромілі асн. сілы паўстанцаў, але неўраджай і голад у пач. 1640-х г. прыцягнулі да паўстання новыя нар. масы. Кіраўнік Хубэй-Шэньсійскага цэнтра паўстання (з 1636) *Лі Цзычэн* стварыў рэгулярную армію і пачаў ствараць уласныя органы ўлады. У пач. 1644 ён быў абвешчаны ў г. Сіянь імператарам. 25.5.1644 яго войскі ўвайшлі ў Пекін; апошні імператар дынастыі скончыў самагубствам. Тым часам У Саньгуй, камандуючы ўрадавай арміяй, якая ахоўвала паўн. мяжу, заключыў саюз з маньчжурамі і прапусціў іх войска праз Вял. кіт. сцяну. У баі 27.5.1644 маньчжуры разбілі войскі Лі Цзычэна (ён загінуў у 1645), у 1647 — войска Чжан Сяньчжуна, у Кітаі запанавала дынастыя *Цын*.

СЯЛЯ́НСКАЯ ВАЙНА́ 1670—71 у Расіі, Разіна паўстанне, масавы антыўрадавы рух казакаў, прыгонных сялян, пасадскіх людзей, паволжскіх народаў (чувашоў, мары, мардвы, татар) на Доне, у Паволжы і *Слабадской Украіне*. Выклікана ўзмацненнем прыгонніцтва ў Цэнтр. Расіі і пашырэннем яго на паўд. і паўд.-ўсх. ўскраіны. Кіраўнікі: С.Ц.*Разін*, В.Р.Ус, Ф.Шалудзяк і інш. С.в. папярэднічаў у 1667—69 паход казацкай беднаты на чале з Разіным на р. Яік (цяпер Урал) і па Каспійскім м. (разрабаваны прыбярэжныя правінцыі Персіі, вызвалены рас. нявольнікі), пасля заканчэння якога Разін заснаваў на Доне апорны пункт — Кагальніцкі гарадок. Сюды збіраліся казакі і збеглыя сяляне. Вясной 1670 Разін захапіў уладу на Доне і на чале сваіх атрадаў пайшоў на Ніжнюю Волгу. Паўстанцы нанеслі паражэнні ўрадавым войскам, у маі—чэрв. 1670 авалодалі гарадамі Царыцын, Чорны Яр, Астрахань, дзе знішчылі царскіх ваявод і ўвялі самакіраванне на казацкі ўзор. У жн. 1670 Разін на чале войска (каля 10 тыс. чал.) пайшоў уверх па Волзе, авалодаў гарадамі Самара, Саратаў і інш., асадзіў Сімбірск. Ён і яго паплечнікі абвяшчалі, што ў іх войску нібыта знаходзяцца царэвіч Аляксей Аляксеевіч (сын *Аляксея Міхайлавіча*), які паводле бацькоўскага ўказа ідзе на Маскву «пабіць» баяр, дваран, ваявод і купцоў «за здраду», а таксама звергнуты патрыярх *Нікан*. У сваіх «спакусных лістах» Разін заклікаў паслужыць цару і «чорным людзям даць свабоду». Паўстанні ахапілі вялізную тэр. аж да цэнтр. раёнаў краіны: знішчаліся памешчыкі і іх прыказчыкі, ваяводы і інш. прадстаўнікі ўлады, ствараліся мясц. самакіраванне. У кастр. 1670 ваявода Ю.Барацінскі разбіў каля Сімбірска гал. войска Разіна, які быў паранены і ўцёк на Дон. У канцы 1670 — пач. 1671 царскія войскі жорстка задушылі асн. ачагі сял. вайны, акрамя Астрахані. Заможныя казакі скінулі ўладу Разіна на Доне, у крас. 1671 схапілі яго і выдалі ўраду (16.6.1671 пакараны смерцю ў Маскве). Паўстанцы з Астрахані на чале з Ф.Шалудзяком у маі—чэрв. 1671 здзейснілі новы няўдалы паход на Сімбірск. У снеж. 1671 Астрахань здалася царскім войскам. Тэрмін «С.в. 1670—71», які замацаваўся ў сав. гіст. л-ры з 1930-х г., у сучаснай рас. гіст. л-ры (з пач. 1990-х г.) найчасцей замяняецца тэрмінам «паўстанне Разіна».

Літ.: Степанов И.В. Крестьянская война в России в 1670—1671 гг. Т. 1—2 (ч. 1). Л., 1966—72; Соловьев В.М. Поход за утраченной волей. М., 1990; Его ж. Современники и потомки о восстании С.Т.Разина. М., 1991.

М.Г.Нікіцін.

СЯЛЯ́НСКАЯ ВАЙНА́ 1773—75 у Расіі, Пугачова паўстанне, масавы антыўрадавы рух казакаў, прыгонных сялян, заводскіх рабочых, нярус. народаў (асабліва башкіраў на чале з *Салаватам Юлаевым*) пад кіраўніцтвам Е.І.*Пугачова* на р. Яік (цяпер Урал), Урале, у Зах. Сібіры, Прыкам'і, Паволжы, Зах. Казахстане і Слабадской Украіне. Выклікана ўзмацненнем прыгонніцтва, уціскам казакаў і нярус. народаў з боку рас. ваен. і цывільнай бюракратыі, прадпрымальнікаў. Пачалася ў вер. 1773 як паўстанне яіцкіх казакаў на чале са збеглым данскім казакам Пугачовым, які абвясціў сябе імператарам Пятром III, быццам бы цудам выратаваным і намерыўся заняць прастол, каб усталяваць «справядлівае» казацкае царства. У вер.-кастр. 1773 Пугачоў захапіў шэраг крэпасцей і ўмацаванняў, дзе знішчаў афіцэраў, забіраў артылерыю, боепрыпасы, і на чале войска (каля 2500 чал., 20 гармат) 16.10.1773 асадзіў г. Арэнбург. Хоць аблога Арэнбурга была беспаспяховай, Пугачоў адбіў некалькі вылазак гарнізона, разбіў карныя атрады ген. В.А.Кара і палк. П.М.Чарнышова. Яго армія, куды прыбывалі сяляне, работнікі уральскіх заводаў (прывозілі з сабой і гарматы), башкірскія і інш. атрады, у снеж. 1773 налічвала 25 тыс. чал. і 86 гармат. З яе складу вылучаліся асобныя атрады, якія пашыралі паўстанне на суседнія тэрыторыі. Кіравала арміяй і была адм.-паліт. цэнтрам паўстання Ваен. калегія. У сваіх маніфестах і ўказах ад імя Пятра III Пугачоў абяцаў казакам, сялянам і прыгнечаным народам волю і зямлю, заклікаў іх разам змагацца супраць улады Кацярыны II і дваран. У крас. 1774 урадавыя войскі разбілі армію Пугачова, які адступіў на Урал і ў Зах. Сібір, дзе зноў авалодаў шэрагам крэпасцей. Пасля новых няўдалых баёў з урадавымі атрадамі ён накіраваўся да Паволжа з мэтай ісці на Маскву. 23.7.1774 яго армія штурмам узяла г. Казань (акрамя крамля), але 23—26 ліп. была разбіта атрадам падпалк. І.І.Міхельсона. Пугачоў перайшоў на правы бераг Волгі, дзе пачалося ўсеагульнае паўстанне сялян супраць памешчыкаў і адміністрацыі. Маніфестамі ад 28 ліп. і



Да арт. **Сялянская вайна 1773—75.** М.І.Авілаў. Рабочыя прывозяць Пугачову гарматы. 1924.

11 жн. 1774 ён («імператар Пётр III») вызваляў сялян ад прыгону і заклікаў знішчаць памешчыкаў. На чале новага войска Пугачоў пайшоў на Пд, узяў Саранск, Пензу, Саратаў і інш. гарады, але 5.9.1774 канчаткова разбіты Міхельсонам на Пд ад г. Царыцын. Неўзабаве яго схапілі і выдалі ўладам яго прыбліжаныя; пасля следства і суда ён з найб. актыўнымі паплечнікамі 21.1.1775 пакараны смерцю ў Маскве. Былі забіты, пакараны смерцю, закатаваны, зазналі цяжкія цялесныя пакаранні, катаргу і ссылку тысячы інш. удзельнікаў сял. вайны, апошнія ачагі якой задушаны да лета 1775. Тэрмін «С.в. 1773—75» побач з тэрмінам «паўстанне Пугачова» замацаваўся ў сав. гістарыяграфіі з 1940—50-х г. У сучаснай рас. гіст. л-ры (з 1990-х г.) найчасцей ужываецца тэрмін «паўстанне Пугачова».

Літ.: Крестьянская война в России в 1773—1775 гг.: Восстание Пугачева. Т. 1—3. Л., 1961—70; Овчинников Р.В. Манифесты и указы Е.И.Пугачева: Источниковедч. исслед. М., 1980. *М.Г.Нікіцін.*

СЯЛЯ́НСКАЯ ВАЙНА́ ПАЧА́ТКУ 17 ст., пашыраны ў савецкай гістарыяграфіі тэрмін для абазначэння сукупнасці разнастайных па сваёй прыродзе і складзе іх удзельнікаў масавых хваляванняў у Расіі пач. 17 ст., у т.л. *Балотнікава паўстання 1606—07.* Гл. «*Смута*».

«СЯЛЯ́НСКАЯ ДО́ЛЯ», газета арг-цыі «Беларускае працоўнае сялянства». Выдавалася ў чэрв. 1921 — крас. 1922 у г. Каўнас (Літва) на бел. мове, выходзіла нерэгулярна. Рэдакцыя стаяла на пазіцыях непадзельнасці і незалежнасці Беларусі, прапаведавала ідэю сац. і нац. самаўсведамлення сялянства, гуртавання яго сіл на вызв. барацьбу супраць польскай акупацыі. Асобныя публікацыі скіраваны на барацьбу за незалежнасць Беларусі. Аддавала ўвагу выбарам у Віленскі сойм, пытанню далучэння Віленшчыны да Польшчы. Змясціла рэзалюцыі 1-й Усебел. канферэнцыі (вер. 1921, Прага), дэкларацыю ўрада БНР у сувязі з 4-й гадавінай абвяшчэння суверэнітэту Беларусі, матэрыялы пра каап. рух і школьнае пытанне. Друкавала творы П.Мядзёлкі, А.Смаленца, І.Дварчаніна (пад псеўд. І.Гудок), В.Мурашкі (В.Маслоўскай), В.Ластоўскага (пад псеўд. Юрый В.), Т.Грыба (пад псеўд. А.Небарака), М.Бяздольнага. Выйшла 7 нумароў. *А.С.Ліс.*

«СЯЛЯ́НСКАЯ НІ́ВА», грамадска-палітычная, літ. і гасп. газета *Беларускага сялянскага саюза.* Выдавалася з 6.12.1925 да 7.7.1930 у Вільні на бел. мове 2 разы на тыдзень. Выдавец Ф.*Ярэміч.* Праціпастаўляла сац.-паліт. і нац. інтарэсы зах.-бел. сялянства «нацыянальначужому» гораду, культывавала бел. сял. традыцыі. Адстойвала сваю тактыку барацьбы за нац. незалежнасць. Друкавала вершы М.Васілька, М.Краўцова, Т.Леўчыка, Улад-Ініцкага (У.Паўлюкоўскага), Ф.Грышкевіча, Я.Башкіра (І.Пачопкі), П.Крэня, С.Пеюна (Новік-Пеюна), П.Сокала (Масальскага), Я.Нарцызава (Драздовіча), апавяданні А.Васілеўскага, С.Грынкевіча. Змясціла агляд творчасці Я.Купалы, зроблены Я.Светазарам (Краўцовым), рэцэнзію на зб. паэзіі У.Жылкі «На ростані», літ.-гіст. нататку пра Эмілію Плятар, фалькл.-этнагр. артыкулы М.Вяршыніна, М.Пецюкевіча, перадрук паэмы Я.Коласа «Сымон-музыка», пераклады з Гі дэ Мапасана, А.Дадэ, Э.Заля. Выйшлі 199 нумароў, асобныя канфіскаваны цэнзурай. *А.С.Ліс.*

«СЯЛЯ́НСКАЯ ПРА́ЎДА», заходнебеларуская газета. Выдавалася з 28.9 да 17.12.1924 у Вільні на бел. мове 3 разы на тыдзень. Рэдактар А.Войцік. Выкрывала палітыку польскага ўрада ў дачыненні да працоўных і нац. меншасцей. Паказвала партыз. рух у Зах. Беларусі, нацэльвала масы на адстойванне сваіх паліт. і эканам. правоў, на змаганне за бел. школу, асвету, кааператывы. Крытыкавала бел. праўрадавых паліт. дзеячаў, творцаў «Беларускага грамадзянскага сабрання» С.Валэйшы, «Тымчасовай беларускай рады» Паўлюкевіча і інш. Асвятляла грамадска-паліт. жыццё ў БССР. Змяшчала артыкулы Дрыгавіча (У.Талочкі), Я.Маразовіча, інтэрв'ю М.Чарвякова з А.Пшчолкам, рэцэнзіі на пастаноўкі Бел. драм. майстроўні і інш. Выйшлі 34 нумары. Забаронена польскімі ўладамі. *А.С.Ліс.*

СЯЛЯ́НСКАЯ РЭФО́РМА 1861, якой скасавана *прыгоннае права* ў Рас. імперыі, у т.л. на Беларусі. Абумоўлена крызісам феад.-прыгонніцкай сістэмы і развіццём капіталіст. адносін, паскорана паражэннем Расіі ў *Крымскай вайне 1853—56* і ўздымам рэв., найперш сял. руху.

У студз. 1857 створаны Сакрэтны к-т на чале з царом; у пач. 1858 рэарганізаваны ў Гал. к-т па сял. справе для выпрацоўкі плана паступовага вызвалення сялян. Урад ініцыраваў прапанову памеснага дваранства літ. і зах.-бел. губерняў аб беззямельным вызваленні панскіх сялян. Паводле *рэскрыптаў Аляксандра II 1857* створаны дваранскія губ. к-ты па падрыхтоўцы праектаў рэформы, матэрыялы якіх у 1859—60 разгледжаны ў *Рэдакцыйных камісіях.* 3.3.1861 Аляксандр II падпісаў «Маніфест» і «Палажэнні аб сялянах, што выйшлі з прыгоннай залежнасці». У выніку сяляне атрымалі асабістую волю і права свабодна распараджацца сваёй маёмасцю. Памешчыкі захоўвалі за сабой землі маёнткаў, пры ўмове захавання ў пастаянным карыстанні сялян іх сядзіб і палявых *надзелаў* за адпаведныя павіннасці — *паншчыну* ці *аброк.* Памеры надзелаў і павіннасцей фіксаваліся ва *ўстаўных граматах*, складанне якіх даручалася памешчыкам, іх праверка, зацвярджэнне і ўвядзенне ў дзеянне — *міравым пасрэднікам.* Сяляне атрымалі права выкупу сядзібы і, пры згодзе памешчыка, — палявых угоддзяў. Да ажыццяўлення гэтага яны наз. *часовавабавязанымі сялянамі.* Выкупны кошт надзелу вызначаўся аброкам, капіталізаваным з 6% гадавых. Т.ч. сяляне фактычна выкуплялі не зямлю, а феад. павіннасці, г.зн. асабістую волю (гл. *Выкупная аперацыя*). *Дваровыя людзі* атрымалі асабістую волю, але вызваляліся без зямлі і на працягу 2 гадоў заставаліся ў феад. залежнасці ад паноў. Вызначаліся структура, правы і абавязкі органаў сял. грамадскага кіравання (сельскага, валаснога) і *валаснога суда.* У 4 «мясцовых палажэннях» вызначаліся памеры зямельных надзелаў і павіннасцей сялян за карыстанне імі ў 44 губернях еўрап. ч. Расіі. Паводле «Мясц. палажэння» для 35 рус., усх.-бел. і паўд.-ўкр. губерняў, у нечарназёмных рэгіёнах вышэйшы надзел на рэвізскую душу складаў ад 3 да 7 дзес., ніжэйшы — $^1/_3$ вышэйшага; у чарназёмных — вышэйшы надзел ад 2,75 дзес., ніжэйшы — 1,2 дзес.; у стэпавых рэгіёнах уводзіўся адзіны «вказальны» надзел: ад 6 да 12 дзес. у рус. губернях і ад 3 да 6,5 дзес. ў паўд.-ўкр. на рэвізскую душу. Калі дарэформенны сял. надзел быў большы за вышэйшы або калі ў памешчыка заставалася менш чым $^1/_3$ зямлі маёнтка, зямля адразалася на яго карысць. Надзелы маглі памяншацца і паводле спец. пагаднення сялян з памешчыкамі ці пры атрыманні імі *даравальнага надзелу.* Калі надзел селяніна быў меншы за ніжэйшы памер, памешчык прыразаў яму зямлю або памяншаў павіннасці. За вышэйшы душавы надзел вызначаўся аброк ад 8 да 12 руб. у год ці паншчына — 40 мужчынскіх і 30 жан. рабочых дзён у год. Калі надзел быў меншы за вышэйшы, павіннасці памяншаліся.

На Беларусі С.р. праводзілася на падставе «Агульнага палажэння» і 2 «Мясц. палажэнняў». На 8 бел.-рус. паветаў Віцебскай і Магілёўскую губ. пашыралася разгледжанае вышэй «Мясц. палажэнне». Вышэйшы надзел на рэвізскую душу складаў ад 4 да 5,5, ніжэйшы — 1,3—1,8 дзесяціны. На У Беларусі, як і ў рус. і паўд.-ўкр. губернях, дарэформенны сял. надзел мог быць паменшаны. За вышэйшы надзел аброк складаў 8 руб. у год. «Мясц. палажэнне» для Віленскай, Гродзенскай, Ковенскай, Мінскай, Дрысенскага і латгальскіх пав. Віцебскай губ. замацоўвала за сялянамі землі, што былі ў іх пастаянным карыстанні напярэдадні рэформы. Сял. надзел абразаўся, калі ён быў большы за інвентарны або калі ў памешчыка заставалася менш за 1/3 прыдатнай зямлі. Вызначаліся максімальныя памеры аброку — 3 руб. з дзесяціны палявога надзелу ў год і паншчыны — 23 мужчынскія і жан. дні ў год (на 10% менш за інвентарныя). «Мясц. палажэнні» невыразна вызначалі правы сялян на сервітутныя і агульныя з памешчыкамі зямельныя ўгоддзі. На Беларусі «палажэнні» аб адмене прыгону ўзаконілі абеззямеленне сялян, якое вырасла з часу *інвентарнай рэформы 1840—50-х гадоў* і ў час падрыхтоўкі адмены прыгону. Пры рэалізацыі С.р. памешчыкі таксама абеззямелілі вял. колькасць сялян Беларусі і інш. рэгіёнаў еўрап. ч. імперыі. У сялян рас. чарназем'я яны адрэзалі каля $^1/_5$, інш. мясцовасцей — $^2/_5$ надзельнай зямлі (гл. *Адрэзкі*). Масавыя сял. хваляванні на Беларусі і ў Літве і *паўстанне 1863—64* прымусілі ўрад спыніць абавязковыя адносіны сялян Віленскай, Гродзенскай, Ковенскай, Мінскай, Дрысенскага і латгальскіх пав. Віцебскай губ. да памешчыкаў з 13.5.1863 і пачаць іх перавод на абавязковы выкуп з паніжэннем выкупных плацяжоў на 20%. З 13.1.1864 гэтыя правілы пашыраны на Магілёўскую і астатнія 8 паветаў

Віцебскай губ. У пач. 1870-х г. большасць б. панскіх сялян Беларусі перавялі на выкуп. У адпаведнасці з цыркулярамі віленскага ген.-губернатара М.М.*Мураўёва* ад 29.8 і 30.10.1863 сялянам, абеззямеленым памешчыкамі ў 1846—56, давалі па 3 дзес. зямлі; пазбаўленым яе з 1857 вярталі надзелы, роўныя надзелам астатніх сялян. Сялянам вярталі права карыстання сервітутамі і агульнымі з памешчыкамі пашамі. На пераважнай ч. тэр. Беларусі царызм пайшоў на большае скарачэнне выкупных плацяжоў, чым планавалася. У Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губ. яны зменшаны на 64,9—75,4%. Гэтыя ўступкі прыкметна змякчылі, але істотна не змянілі грабежніцкага ў адносінах да сялян характару рэформы. Пераважная большасць абеззямеленых атрымала па 3 дзес. на двор, што было недастаткова для вядзення гаспадаркі і ўтрымання сям'і. У 1877 на Беларусі памешчыцкія землі складалі 50,5% агульнай плошчы прыдатных зямель, а надзельныя землі б. панскіх сялян — 24,6%. Нягледзячы на зніжэнне памераў выкупу на 3 і ў цэнтры Беларусі, агульная сума выкупных плацяжоў з сялян 5 зах. губерняў у 3,3 раза перавышала кошт надзельнай зямлі на мясц. зямельным рынку ў час пераходу на выкуп і ў 2,3 раза — суму атрыманай імі дзярж. выкупной пазыкі. У велікарус. губернях еўрап. ч. краіны пераход сялян на выкуп расцягнуўся на некалькі дзесяцігоддзяў. Да 1881 тут заставаліся часовааабавязанымі 1552 тыс. рэвізскіх душ (15% сялян). 9.1.1882 выдадзены закон аб абавязковым выкупе з 13.1.1883. Перавод на яго завяршыўся да 1895. У выніку выкупной аперацыі дзяржава атрымала 700 млн. руб. прыбытку, у т.л. каля 100 млн. — у 5 зах. губернях. С.р. ў вял. ступені вызначыла кірунак эканам., сац. і паліт. эвалюцыі вёскі 2-й пал. 19 — пач. 20 ст. Яна стварыла ўмовы для ўсталявання капіталіст. спосабу вытв-сці, паскорыла развіццё агр. капіталізму, прадукц. сіл сельскай гаспадаркі, але не вырашыла *аграрнага пытання*, бо на вёсцы, як і раней, панавала памешчыцкае латыфундыяльнае землеўладанне, захоўваўся шэраг інш. перажыткаў прыгонніцтва.

Літ.: Фридман М.Б. Отмена крепостного права в Белоруссии. Мн., 1958; Зайончковский П.А. Отмена крепостного права в России. 3 изд. М., 1968; Литвак Б.Г. Переворот 1861 г. в России: почему не реализовалась реформаторская альтернатива. М., 1991.

В.П.Панюціч.

СЯЛЯ́НСКІ БАНК, Сялянскі пазямельны банк, пазямельны іпатэчны дзярж. банк у Расіі ў 1882—1917 для выдачы сялянам доўгатэрміновых пазык на набыццё прыватнаўласніцкіх зямель. На Беларусі аддзяленні банка дзейнічалі ў Вільні, Віцебску, Гродне, Мінску і Магілёве. Пры садзейнічанні банка ў бел. губернях да 1895 сялянамі куплена 425,1 тыс. дзес. зямлі (50% усіх сял. зямельных пакупак). Да 1895 працэнтная стаўка складала 7,5—8,5%, потым яна зніжана, банк атрымаў права купляць ва ўласны зямельны фонд памешчыцкія (з 1905 без абмежаванняў), з 1906 — удзельныя і казённыя землі, якія потым перапрадаваліся сял. гаспадаркам і т-вам. За 1906—16 С.б. скупіў па Расіі 4,6 млн. дзес. зямлі і 3,8 млн. з іх прадаў асобным гаспадарам. У гады *сталыпінскай аграрнай рэформы* ён шырока практыкаваў пазыкі пад залог надзельных зямель пры перасяленні сялян на *хутары*, адрубы (гл. *Водруб*) і на новыя землі. Найб. пазыкі выдаваліся аднаасобным і хутарскім гаспадаркам. На Беларусі С.б. займаў 1-е месца па аб'ёме іпатэчных аперацый. Пры яго пасрэдніцтве тут купілі зямлю 215 тыс. сялян-гаспадароў. Аднак імкненне банка да захавання высокіх цэн на зямлю адмоўна адбівалася на пакупніцкай здольнасці пазычальнікаў і патэнцыяльных пакупнікоў, вяло да росту нядоімак па пазыках і зніжэння попыту на паслугі банка. У 1906—15 па Расіі за нявыплату чарговых плацяжоў у пазычальнікаў адабрана 0,6 млн. дзес. зямлі. Колькасць пазычальнікаў у 1910—14 скарацілася са 134 тыс. да 64 тыс. чалавек. С.б. ліквідаваны дэкрэтам Сав. ўрада ад 8.12.1917, а яго землі нацыяналізаваны ў адпаведнасці з Дэкрэтам аб зямлі ад 9.11.1917.

Літ.: Вдовин В.А. Крестьянский поземельный банк (1883—1895 гг.). М., 1959.

В.М.Сяховіч.

СЯЛЯ́НСКІ ІНТЭРНАЦЫЯНА́Л (Сялінтэрн), Міжнародны сялянскі савет (МСС), міжнародная сялянская рэв. арг-цыя ў 1923—33; створана на кангрэсе прадстаўнікоў сял. арг.-цый СССР, Польшчы, Германіі, Францыі, Чэхаславакіі, Балгарыі, ЗША, Мексікі, Нарвегіі, Швецыі, Фінляндыі, Індакітая, Японіі і інш., які адбыўся 10—16.10.1923 у Маскве. Асн. задача — абарона інтарэсаў прац. сялянства, уключэнне яго ў рэв. барацьбу пад лозунгам «Сяляне і рабочыя ўсіх краін, яднайцеся!». На чале Сялінтэрна стаяў Савет, які складаўся з прадстаўнікоў сял. арг-цый краін, што ўваходзілі ў С.і. Савет выбіраў пастаянна дзеючы орган — Прэзідыум на чале з ген. сакратаром. Друкаваныя органы: час. «Крестьянский интернационал» і «Международный крестьянский бюллетень». Для тэарэт. вывучэння агр. пытання і сял. руху ў 1926 створаны Міжнар. агр. ін-т. Кіруючыя органы С.і. знаходзіліся ў Маскве.

СЯЛЯ́НСТВА (ад бел. селянін — жыхар сяла, вёскі), традыцыйная сац. група непасрэдных с.-г. вытворцаў, якія вялі гаспадарку сіламі сваёй сям'і, уласнымі прыладамі і цяглавай сілай на сваёй або арандаванай зямлі; карысталіся пэўнымі правамі і неслі абавязкі (павінасці); мелі ўласцівыя ім псіхал. рысы: прыхільнасць да традыцыі ў вытв-сці, побыце, свядомасці, схільнасць да мясц. замкнутасці і г.д. Ва ўсіх дакапіталіст. і раннекапіталіст. грамадствах С. складала асн. частку насельніцтва і аказвала значны ўплыў на іх гісторыю. З прагрэсам вытв. сіл і развіццём грамадскага *падзелу працы* сяляне ўцягваліся ў сац.-эканам. сувязі, што ствараліся таварнагрошовымі адносінамі, і падвяргаліся сац. расслаенню. З іх асяроддзя ў значнай ступені сфарміраваліся класы гар. наёмных работнікаў і прадпрымальнікаў. З глыбокай старажытнасці існаваў комплекс сац.-эканам. і паліт. праблем, звязаных з сял. *землекарыстаннем* і *землеўладаннем* і канфліктамі паміж С. і інш. катэгорыямі землекарыстальнікаў (землеўладальнікаў) — т.зв. *аграрнае пытанне*. Для яго вырашэння на працягу ўсёй гісторыі дзярж. формы грамадства праводзіліся і праводзяцца шматлікія *аграрныя рэформы*, якія ў залежнасці ад таго, якія сац.-паліт. сілы іх праводзяць, маюць розны змест і па-рознаму адбіваюцца на лёсах сялян. У развітым рыначным грамадстве С. — адносна нешматлікі сац. слой (напр., у с.-г. вытв-сці Германіі ў 1990-я г. было занята 6% працаздольнага насельніцтва, Нідэрландаў — 4%, Вялікабрытаніі — 1,2%). У адных з гэтых краін амаль завершаны, у інш. працягваецца працэс замены традыц. сял. гаспадарак на чыста капіталіст. фермерскія і памяншэння колькасці С. У краінах, што развіваюцца, эвалюцыя С. ўскладнена агульнай адсталасцю сац.-эканам. развіцця. Тут, як і раней, С. складае большую ч. эканам. актыўнага насельніцтва (у 1990-я г. ў Індыі 65%, Кітаі 60%, Кеніі каля 80% і г.д.), адыгрывае значную ролю ў эканам. і грамадска-паліт. жыцці. З разбурэннем пазямельнай *абшчыны* С. розных краін здаўна аб'ядноўваецца ў пэўныя формы с.-г. *кааперацыі*. У СССР фарсіраванае кааператыўнае сельскай гаспадаркі адбывалася ў выглядзе *калектывізацыі*. З развіццём *індустрыялізацыі* колькасць сельскага насельніцтва тут значна паменшылася (34% у 1987). У б. рэспубліках СССР з ліквідацыяй сацыяліст. эканам. і грамадскіх адносін далейшы лёс фактычна рассяляненага сельскага насельніцтва залежыць ад шляхоў і поспеху праводзімых рыначных рэформ.

Як грамадскі клас С. складвалася на аснове аддзялення рамяства ад земляробства пры распадзе *першабытнага грамадства* і ўсталяванні прыватнай уласнасці на сродкі вытв-сці. На тэр. Беларусі гэты працэс адбываўся ў канцы 1-га — пач. 2-га тыс. н.э. З развіццём *феадалізму* С. разам з *феадаламі* складала адзін з 2 асн. класаў грамадства. У ВКЛ, куды з 13—14 ст. уваходзіла Беларусь, сяляне знаходзіліся ў эканам. і юрыд. залежнасці ад дзяржавы, свецкіх феадалаў і рэліг. устаноў, зямлёй якіх яны карысталіся, выконваючы за гэта пэўныя павіннасці (*паншчына, аброк, чынш* і інш.). У 15—16 ст. сфарміравалася *прыгоннае права* і розныя катэгорыі феад. залежных сялян (*людзі «пахожыя», людзі «непахожыя»», отчычы, закупы* і інш.) ператварыліся ў адзінае саслоўе прыгонных сялян, якія фактычна з'яўляліся ўласнасцю феадалаў. У апошняй чвэрці 18 ст. на Беларусі дзяржава валодала 24,6% сял. гаспадарак, свецкія феадалы — 65%, царква — 10,4%. З далучэннем бел. зямель да Рас. імпе-

рыі (1772—95) становішча С. істотна не змянілася. Пасля *сялянскай рэформы 1861*, якая скасавала прыгоннае права, пачаўся працэс класавай дыферэнцыяцыі С. на сельскую буржуазію (*кулацтва*) і сельскі пралетарыят, пераважна з *надзелам*. Грамадз. правы С. заставаліся істотна абмежаванымі, яно несла асн. цяжар падаткаў і вайсковай павіннасці. У 1897 сельскае насельніцтва Беларусі (пераважна С.) складала 5774 тыс. чал. (86,5% усяго насельніцтва). Пасля *Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917* прыватная ўласнасць на зямлю скасавана, частка канфіскаванага памешчыцкага і інш. буйнога землеўладання размеркавана сярод беззямельных і малазямельных сялян.

Калектывізацыя 1930 — пач. 50-х г., якая суправаджалася *раскулачваннем*, спрыяла ўтварэнню якасна новай сац.-класавай групы — калгаснага С. У выніку індустрыялізацыі і працэсаў урбанізацыі колькасць сельскага насельніцтва (пераважна сялян-калгаснікаў і блізкіх да іх рабочых *саўгасаў*) увесь час скарачалася. У 1939 яно складала 7057 тыс. чал. (79,2% усяго насельніцтва), у 1959 — 5575 тыс. (69,2%), у 1979 — 4297 тыс. (44,9%), у 1999 — 3084 тыс. (30,7%). З б. сялян паходзіць асн. маса сучасных рабочых, служачых, інтэлігенцыі. З пач. 1990-х г. адбываецца рэфармаванне і пераўтварэнне калгасаў і саўгасаў на аснове прынцыпаў рыначнай эканомікі праз стварэнне на іх базе калектыўна-долевых сельгаспрадпрыемстваў, акц. т-ваў і інш. новых фарміраванняў, што аб'ектыўна вядзе да далейшага скарачэння колькасці занятага ў іх С. Фарміруецца сац. слой індывід. с.-г. прадпрымальнікаў — фермерства (гл. *Фермерская гаспадарка*), якое выкарыстоўвае працу наёмных с.-г. рабочых.

Літ.: Сказкин С.Д. Очерки по истории западноевропейского крестьянства в средние века. М., 1968; Аграрный вопрос и роль крестьянства в развивающихся странах // Проблемы мира и социализма. 1978. № 12; Классы и сословия средневекового общества. М., 1988; История крестьянства России с древнейших времен до 1917 г.: В 5 т. Т. 1—3. М., 1987—93; Фридман М.Б. Отмена крепостного права в Белоруссии. Мн., 1958; Победа колхозного строя в Белорусской ССР. Мн., 1981; Панютич В.П. Социально-экономическое развитие белорусской деревни в 1861—1900 гг. Мн., 1990; Сарокін А.М. На ростанях айчыннай гісторыі: Бел. вёска: Ад Дэкрэта да Кодэкса аб зямлі (1917—1990-я гг.). Мн., 1999. *М.Г.Нікіцін.*

СЯЛЯЎСКАЕ ВО́ЗЕРА. У Расонскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Дрыса, за 10 км на Пд ад г.п. Расоны. Пл. 1,11 км², даўж. 2,3 км, найб. шыр. 710 м, найб. глыб. 6,1 м, даўж. берагавой лініі 7,4 км, пл. вадазбору 4,4 км². Катлавіна складанага тыпу. Схілы выш. 7—10 м (на ПнУ да 18 м, на У 2—4 м), у ніжняй частцы пад хмызняком, у верхняй разараныя. Берагі нізкія, на ПнЗ да 0,5 м, на ПнУ зліваюцца са схіламі, пясчаныя, на Пд тарфяністыя, на ПдУ утвараюць некалькі заліваў. На Пд забалочаная пойма шыр. да 350 м, парослая хмызняком. Дно пераважна выслана сапрапелем, на З ілам, каля берагоў пясчанае. Паласа расліннасці ўздоўж берагоў шыр. 10—200 м, пашырана да глыб. 2,3 м. Упадае 1 ручай, на Пд выцякае ручай у воз. Убежа.

СЯЛЯ́ЎШЧЫНА, вёска ў Янкавіцкім с/с Расонскага р-на Віцебскай вобл., на ўсх. беразе воз. Сяляўскае, на аўтадарозе Расоны—Полацк. Цэнтр калгаса. За 12 км на Пд ад г.п. Расоны, 147 км ад Віцебска, 40 км ад чыг. ст. Полацк. 421 ж., 166 двароў (2002). Базавая школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Магілы ахвяр фашызму. Помнікі на месцы партыз. аэрадрома і землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

СЯМА́К Аляксандр Яфімавіч (н. 21.10.1938, с. Пятроўка Шчорскага р-на Чарнігаўскай вобл., Украіна), бел. вучоны ў галіне неўралогіі. Д-р мед. н. (1986), праф. (1994). Скончыў Мінскі мед. ін-т (1961). З 1970 ў Бел. мед. ун-це. Навук. працы па метадах вымярэння ўнутрычарапнога ціску, пытаннях востpай унутрычарапной гіпертэнзіі, прагназаванні ўзнікнення мазгавых інсультаў і іх прафілактыцы.

Тв.: Острая внутричерепная гипертензия. Мн., 1974 (разам з В.У.Еўсцігнеевым); Мозговой инсульт: прогнозирование и профилактика. М., 1980 (разам з М.С.Місюком, Я.Р.Грышковым).

СЯМА́ШКА Аляксандр Мікалаевіч (н. 28.2.1952, Мінск), бел. вучоны ў галіне вылічальнай тэхнікі і сістэм кіравання. Д-р тэхн. н. (1993), праф. (1994). Скончыў Мінскае інж.-зенітнае ракетнае вучылішча ППА (1974), дзе і працаваў з 1980 (у 1991—2002 нач. лабараторыі). Навук. працы па многафункцыянальных аўтаматах, элементнай базе ЭВМ, тэорыі жывучасці складаных сістэм.

Тв.: Многофункциональные автоматы и элементная база цифровых ЭВМ. М., 1981 (разам з В.Дз.Казюмінскім, В.А.Мішчанкам); Параллельная обработка информации. Т. 4. Киев, 1988 (у сааўт.).

СЯМА́ШКА (дзявочае Ісаева) Валянціна Антонаўна (1868, г. Слуцк Мінскай вобл. — 1938), бел. піяністка, педагог. Скончыла Маскоўскую кансерваторыю (1889, кл. В.Сафонава). Выступала як піяністка-салістка і ў ансамблі з віяланчэлістам М.Сямашкам. З 1920 выкладала ў муз. студыі і школе ў Мінску, з 1924 — у Мінскім муз. тэхнікуме, з 1932 дацэнт Бел. кансерваторыі. Развівала традыцыі рус. фартэпіяннай школы на Беларусі. Сярод вучняў: С.*Талкачоў*, І.Цвятаева і інш. *І.А.Цвятаева.*

СЯМА́ШКА Дамінік (16.8.1878, Вільня — 27.12.1932), бел. і літ. паліт. дзеяч. У 1898—1901 чл. загранічнага саюза польскіх сацыялістаў у Парыжы, Львове і Цюрыху (у Парыжы член арг-цыі «Сувязь»). Удзельнік бел. нац. руху на Віленшчыне, чл. *Віленскай беларускай рады*, аўтар праекта стварэння Нар. ун-та імя А.Мішкевіча. 25.3.1918 у Мінску ўдзельнічаў у пасяджэнні *Рады Беларускай Народнай Рэспублікі*, якая абвясціла незалежнасць БНР. Як прадстаўнік бел. арг-цый у 1918—19 уваходзіў у *Літоўскую тарыбу*. Быў прыхільнікам федэрацыі Беларусі і Літвы. У складзе літ. дэлегацыі ўдзельнічаў у рабоце *Парыжскай мірнай канферэнцыі 1919—20*, на якой выступаў за далучэнне Віленшчыны і Гродзеншчыны да Літвы. У чэрв. 1920 — лютым 1922 кіраўнік *Міністэрства беларускіх спраў Літвы* ў літ. урадзе. Уваходзіў у склад літ. дэлегацыі пры заключэнні *мірнага дагавора паміж Літвой і РСФСР 1920* «як прадстаўнік беларускага насельніцтва Віленскай і Гродзенскай губерняў». Падтрымліваў ідэю «вялікай Літвы» за кошт этнічна бел. тэрыторый. Пазней працаваў у літ. пажарнай ахове. *У.М.Міхнюк.*



І.**Сямашка**.

СЯМА́ШКА Іосіф (5.1.1799, с. Паўлаўка Вінніцкай вобл., Украіна — 5.12.1868), уніяцкі, потым правасл. царк. дзеяч Рас. імперыі. З сям'і уніяцкага святара. Скончыў Гал. семінарыю пры Віленскім ун-це са ступенню магістра багаслоўя (1820). Кафедральны прапаведнік і праф. багаслоўя Луцкай семінарыі, пасвячоны ў бязжоннага іпадыякана, потым у дыякана (1820). Засядацель Луцкай кансісторыі, пасвячоны ў святара (1821). У 1822 протаіерэй, член 2-га дэпартамента рымска-каталіцкай калегіі (С.-Пецярбург). З 1823 канонік, з 1825 прэлат-схаласт Луцкага уніяцкага кафедральнага капітула, які заставаўся ў Пецярбургу. У 1827 падаў імператару Мікалаю I запіску аб становішчы уніяцкай царквы ў Рас. імперыі і сродках па яе далучэнні да праваслаўя, якая была ўхвалена і стала праграмай далейшых дзеянняў С. З 1829 вікарны епіскап мсціслаўскі Полацкай уніяцкай архіепархіі, старшыня яе кансісторыі. Адначасова захоўваў членства, а потым старшынства ў калегіі (у 1828 створана

асобная Грэка-уніяцкая калегія). З 1833 кіруючы епіскап літоўскі. На гэтай пасадзе вёў падрыхтоўчую работу па скасаванні уніі: ездзіў па епархіях, наглядаў за ўвядзеннем у храмах іканастасаў і служэбнікаў маскоўскага друку, за вынішчэннем арганаў і навучаннем святароў богаслужэнню на царк.-слав. мове і інш., узгадняў арганізац. пытанні з дзярж. ўладамі. У 1836 звярнуўся з лістом да пецярбургскага мітрапаліта Серафіма з прашэннем аб далучэнні да праваслаўя. Быў ініцыятарам і актыўным удзельнікам *Полацкага царкоўнага сабора 1839*. З 1840 правасл. архіепіскап літоўскі і віленскі (з 1852 мітрапаліт). У 1844 пераехаў у сваю епархію ў Жыровічы, потым у Вільню (1845). Садзейнічаў пераводу з Жыровіч у Вільню Літоўскай духоўнай семінарыі. З 1847 чл. Свяцейшага Сінода. У апошнія гады займаўся дабрачыннасцю, пісаў мемуары.

Тв.: Записки Иосифа, митрополита литовского. Т. 1—3. СПб., 1883. *В.Р.Кірэеў.*

СЯМА́ШКА Мікалай Аляксандравіч (20.9.1874, с. Лівенскае Арлоўскай вобл., Расія — 18.5.1949), расійскі дзярж. дзеяч, адзін з арганізатараў сістэмы аховы здароўя ў СССР. Акад. АМН СССР (1944) і АПН Расіі (1945). Скончыў Казанскі ун-т (1901). У 1918—30 нар. камісар аховы здароўя Расіі, адначасова з 1921 у Маскоўскім ун-це, з 1930 праф., заг. кафедраў 1-га Маскоўскага мед. ін-та, з 1945 дырэктар Ін-та школьнай гігіены. У 1928—36 гал. рэдактар Вял. мед. энцыклапедыі. Навук. працы ў галіне сац. гігіены, арганізацыі аховы здароўя. Пад яго кіраўніцтвам праводзілася работа па барацьбе з эпідэміямі, створана сістэма аховы мацярынства і дзяцінства і інш.

Тв.: Избр. произв. 2 изд. М., 1967.

Літ.: Петров Б.Д. Н.А.Семашко — основоположник советского здравоохранения // Сов. здравоохранение. 1977. № 10.

СЯМА́ШКА Мікола (Мікалай Пятровіч; 1914, в. Барылы Полацкага р-на Віцебскай вобл. — 1941), бел. паэт. Брат С.П.*Сямашкі*. Працаваў у ветрынскай раённай газеце, беластоцкай абласной газ. «Вольная праца». Загінуў у Вял. Айч. вайну пры абароне Оршы. Друкаваўся з 1939. Выдаў зб. вершаў «Шчырасць» (1939). Большасць вершаў лірычнага складу, у іх адчуваецца ўплыў фальклору. Паэтызаваў прыгажосць роднага краю, аптымізм народа.

Тв.: У кн.: Анталогія беларускай паэзіі. Мн., 1961. Т. 3; У кн.: Крывёю сэрца. Мн., 1967.

Літ.: Мы іх не забудзем. Мн., 1949.

СЯМА́ШКА Сцяпан Пятровіч (27.7.1898, в. Барылы Полацкага р-на Віцебскай вобл. — 23.9.1965), бел. пісьменнік. Брат М.*Сямашкі*. Вучыўся ў Камуніст. ін-це журналістыкі ў Мінску (1932). У 1921—26 на парт. рабоце ў Полацку, у 1926—29 рэдактар газ. «Чырвоная Полаччына», з 1930 супрацоўнік час. «Шляхі калектывізацыі», газет «Калгаснік Беларусі», «Звязда». У 1945—46 адказны сакратар Камісіі па гісторыі Вял. Айч. вайны. Друкаваўся з 1926. Аўтар вершаў, апавяданняў, аповесці «Пад панскай пятой» (не скончана). Кн. апавяд. «Пералом» (1932) прысвечана калектывізацыі. *І.Э.Багдановіч.*

СЯМЕ́ЙКА Мікалай Іларыёнавіч (25.3.1923, г. Славянск Данецкай вобл., Украіна — 20.4.1945), удзельнік баёў на Беларусі ў Вял. Айч. вайну. Двойчы Герой Сав. Саюза (19.4 і 29.6.1945). Скончыў Варашылаўградскую ваен. авіяц. школу пілотаў і курсы ўдасканалення начсаставу (1942). У Вял. Айч. вайну з 1943 камандзір экіпажа, звяна, эскадрыллі, штурман штурмавога авіяпалка на Паўд., 4-м Укр. і 3-м Бел. франтах. Удзельнік баёў пад Сталінградам, вызвалення Данбаса, Крыма, Украіны, Беларусі (летам 1944 наносіў удары па



М.Сямашка.



М.І.Сямейка.

ням.-фаш. войсках на чыг. лініі Орша—Мінск, а таксама ў *Мінскім «катле»*). Здзейсніў 227 баявых вылетаў. Загінуў ў баі.

СЯМЕ́ЙНА-АБРА́ДАВАЯ ПАЭ́ЗІЯ, від бел. фальклору; творы, што суправаджалі *абрады*, звязаныя з асн. этапамі жыцця чалавека: нараджэннем, шлюбам, смерцю. Адлюстравала нар. ідэал сямейных узаемаадносін, працоўнай дзейнасці селяніна, яго побыт і жыццё. С.-а.п., як і абрады, павінна была ўздзейнічаць на звышнатуральныя сілы, прыроду і грамадства, каб палепшыць лёс чалавека, яго дабрабыт, аберагчы ад бяды і няшчасцяў. Узнікла ў эпоху першабытнаабшчыннага ладу, пазней набыла спецыфічныя нац. рысы, выяўленыя ў жанрава-вобразнай сістэме, ідэйна-тэматычным змесце і маст. форме. Адметнае месца ў С.-а.п. займала радзінная паэзія (гл. *Радзінныя песні*): песні, прыпеўкі, зычэнні, якімі суправаджаліся пэўныя абрады (найб. поўна захаваліся ў бел. фальклоры). Абрадам і песням прыпісвалася магічная сіла, здольнасць абараніць парадзіху і дзіця ад злых сіл. Вылучаліся велічальныя, жартоўныя і застольна-бяседныя песні. У велічальных услаўляліся парадзіха і бацька дзіцяці, бабка-павітуха, кума і кум. Глыбокай пашанай прасякнуты песні пра маладую маці; клапатлівым і старанным, спагадлівым да жонкі і дзіцяці паказваўся гаспадар. Шмат песень прысвячалася бабцы: шанаванне яе ў песнях спалучалася з дасціпным гумарам. Паступова радзінныя абрады і звязаная з імі паэзія страцілі сакральны, магічны характар і сталі выконваць пераважна эстэтычна-маст. функцыю. Вял. папулярнасць набылі *жартоўныя песні*, выканаўцы якіх добразычліва пацяшаліся з бабкі і кумоў. У *бяседных песнях* з лёгкім гумарам абмалёўваліся ўдзельнікі ўрачыстасці, славілася гасціннасць і шчодрасць гаспадароў, выказвалася радасць з нагоды нараджэння новага чалавека. Найб. захаваліся жартоўныя песні, многія з якіх бытуюць і ў нашч. час. Асаблівым багаццем і паэтычнасцю вылучалася вясельная паэзія (гл. *Вясельныя песні*): песні, прыпеўкі, прыгаворы, прамовы, якія гучалі на працягу ўсяго *вяселля*, пачынаючы з абраду сватання. Выконваліся яны ў пэўным парадку асн. ўдзельнікамі шлюбнай урачыстасці, ролі якіх былі рэгламентаваны традыцыяй. Песні, якія суправаджалі *суборную суботу*, пасад, выпечку каравая, шлюбавіны, пярэзвы і інш., паэтызавалі вясельныя абрады, стваралі ўрачысты настрой і разам з тым служылі пэўным юрыдычным замацаваннем кожнага этапу вяселля. Багатая нар. сімволіка, персаніфікацыя, антытэза, трапныя параўнанні, яркія эпітэты і інш. маст. сродкі і прыёмы стваралі вобразы надзвычайнай выразнасці. Глыбокай эмац. узрушанасцю вылучаліся сіроцкія песні, у якіх нявеста-сірата прасіла бацькоў устаць з магілы і благаславіць яе шлюб. У час застольнай бяседы спявалі таксама песні, непасрэдна не звязаныя з абрадам: велічальныя, лірычныя, жартоўныя і інш. Песні стваралі ідэальныя вобразы маладых, параўноўваючы іх з сімвалічнымі вобразамі сонца, зорак, месяца, паказвалі ўзаемаадносіны жаніха і нявесты, іх стаўленне да бацькоў. У жартоўных вясельных песнях з дасціпным нар. гумарам абмалёўваліся сват, свацця, дружкі, інш. ўдзельнікі вяселля. Завяршальны цыкл С.-а.п. складалі пахавальныя *галашэнні* — імправізаваныя песенна-рэчытатыўныя творы, у якіх аплаквалася смерць блізкага чалавека. Галашэнні, вядомыя з глыбокай старажытнасці, грунтаваліся на веры ў бессмяротнасць душы, на ўяўленнях аб тым, што чалавек і пасля смерці можа дапамагаць або шкодзіць жывым. Смутак, бязмернае гора і душэўны боль гучалі ў галашэннях маці па дзіцяці, жонкі па мужу. Цесна звязаныя з вуснай нар. традыцыяй устойлівыя славесныя формулы, кранальныя вобразы ўзмацнялі эмац. ўздзеянне. Звязаная з жыццём і працай чалавека, С.-а.п. адлюстравала сац.-эканам., быт. і культ. ўмовы яго існавання ў розныя гіст. эпохі.

Публ.: Беларускі фальклор: Хрэстаматыя. 3 выд. Мн., 1985. С. 202—310; Варфоломеева Т.Б. Северобелорусская свадьба: обряд, песенно-мелодические типы. Мн., 1988; Яе ж. Традыцыйныя вяселлі Віцебшчыны. Мн., 1988; Яе ж. Традыцыйнае вяселле Гродзеншчыны. Мн., 1992; Радзінная паэзія. Мн., 1971; Радзіны: Абрад. Песні. Мн., 1998; Пахаванні. Памінкі. Галашэнні. Мн., 1986.

Літ.: Беларуская народна-паэтычная творчасць. Мн., 1979. С. 192—229; Фядосік А.С. Беларуская сямейна-абрадавая паэзія. Мн., 1997; Сямейна-абрадавая паэзія. Народны тэатр. Мн., 2001. *А.С.Фядосік.*

СЯМЕ́ЙНАЕ ВЫХАВА́ННЕ, сістэматычнае мэтанакіраванае ўздзеянне на дзіця дарослых членаў *сям'і* і сямейнага ладу жыцця. Гал. задача С.в. — падрыхтоўка дзіцяці да жыцця ў пэўных сац. умовах. С.в. звычайна будуецца на аснове ідэалогіі, маралі і сістэмы ўзаемаадносін таго сац. пласта, да якога належыць сям'я. Фарміраванне асобы дзіцяці адбываецца ў выніку непасрэднага ўплыву аб'ектыўных умоў яго жыцця ў сям'і (сямейных адносін, структуры сям'і і колькасці яе членаў, прыкладу бацькоў і інш.) і ўздзеяння мэтанакіраванага *выхавання* дарослымі. Свядомая выхаваўчая дзейнасць дарослых становіцца эфектыўнай, калі праводзіцца не адасоблена ад рэальнага жыцця бацькоў, а пацвярджаецца ім. На С.в. істотна ўплывае духоўная культура бацькоў, іх вопыт сац. *зносін*, сямейныя традыцыі. Асобая роля належыць пед. культуры бацькоў, якая дае магчымасць звузіць элемент стыхійнасці, які найбольш уласцівы С.в. Маральнае ўздзеянне сям'і як выхаваўчага ін-та чалавек адчувае на працягу ўсяго жыцця. Аднак уплыў С.в. на розных этапах развіцця дзіцяці неаднолькавы. З паступленнем дзіцяці ў навуч. ўстановы сям'я пачынае падзяляць сваю выхаваўчую функцыю з інш. сац. ін-тамі; чым мацнейшая ўзаемасувязь і пераемнасць паміж С.в. і выхаваннем грамадскім, тым больш значны вынік выхавання як адзінага мэтанакіраванага працэсу.

Літ.: Сухомлинский В.А. Родительская педагогика. Новосибирск, 1985; Титаренко В.Я. Семья и формирование личности. М., 1987; Эволюция семьи в современном обществе. М., 1989; Чечет В.В. Педагогика семейного воспитания. Мн., 1998.

СЯМЕ́ЙНАЕ ПРА́ВА, галіна права, якая рэгулюе маёмасныя адносіны, што ўзнікаюць на аснове шлюбу, сваяцтва, усынаўлення і інш. форм уладкавання дзяцей на выхаванне ў сям'ю. С.п. ўстанаўлівае ўмовы і парадак узяцця *шлюбу*, яго спыненне ці прызнанне несапраўдным; рэгулюе адносіны ў сям'і паміж мужам і жонкай, бацькамі і дзецьмі, інш. членамі сям'і; адносіны ўсынавіцеляў, іх сваякоў з усыноўленымі і іх нашчадкамі, а таксама апекуноў (папячыцеляў) з падапечнымі. Асабістыя і маёмасныя адносіны, што складаюць прадмет С.п., праяўляюцца гал. чынам у рамках *сям'і*, заснаванай на зарэгістраваным у законным парадку шлюбе. Некаторыя сямейна-прававыя сувязі захоўваюцца і па-за сям'ёй (удзел бацькоў у выхаванні і ўтрыманні дзяцей, якія пражываюць асобна, аліментныя абавязкі былых мужа ці жонкі, інш. членаў сям'і). Задачы і прынцыпы С.п. сфармуляваны ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, Кодэксе аб шлюбе і сям'і 1999. С.п. заклікана садзейнічаць умацаванню сям'і, пабудове сямейных адносін на добраахвотным шлюбным саюзе, роўнасці правоў мужа і жонкі ў сям'і, на ўзаемнай любові, павазе і ўзаемадапамозе ўсіх членаў сям'і, устанаўленню правоў дзяцей і забеспячэнню іх прыярытэту ў адпаведнасці з законам, ахове мацярынства і бацькоўства, забеспячэнню спрыяльных умоў для развіцця і станаўлення кожнага дзіцяці. Абарона правоў, што вынікаюць са шлюбных і сямейных адносін, ажыццяўляецца судом, органамі апекі і папячыцельства, а таксама дзярж. органамі, якія рэгіструюць акты грамадзянскага стану. У межах, прадугледжаных заканадаўствам, дапускаецца самаабарона С.п. Значная частка асабістых адносін паміж членамі сям'і застаецца па-за межамі прававога ўздзеяння і рэгламентуецца толькі нормамі маралі. Грамадзянскае, жыллёвае і інш. заканадаўства прымяняецца да сямейных адносін толькі ў выпадку адсутнасці рэгулявання гэтых адносін заканадаўствам аб шлюбе і сям'і. Міністэрствы і інш. рэсп. органы дзярж. кіравання могуць выдаваць нарматыўныя прававыя акты па пытаннях, што датычацца сямейных і шлюбных адносін, у выпадках і межах, прадугледжаных законам. *Э.І.Кузьмянкова.*

СЯМЕ́ЙСТВА, таксанамічная катэгорыя ў біял. сістэматыцы. Аб'ядноўвае блізкія роды, якія маюць агульнае паходжанне. Напр., С. букавых утвараюць роды бук, дуб і інш., С. вавёркавых — роды вавёркі, суркі і інш. Некат. С. маюць вял. колькасць родаў (складанакветныя — каля 1 тыс., хамяковыя — каля 100), іншыя некалькі родаў і нават адзін (напр., бабровыя). Лац. назву С. ўтвараюць шляхам прыбаўлення да асновы тыповага роду канчатка -idae (у заалогіі і вірусалогіі) і -aceae (у батаніцы, мікалогіі і бактэрыялогіі). Буйныя С. часам разбіваюць на падсямействы (канчаткі адпаведна -inae і -oideae), трыбы (калены), падтрыбы (падкалены). Блізкія С. аб'ядноўваюць у атрады ў жывёл і ў парадкі ў раслін, часам у прамежкавыя групы — надсямействы, падатрады і інш.

СЯМЕ́КА Ігар Васілевіч (н. 20.2.1961, г. Гомель), бел. мастак. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1986). З 1992 гал. мастак Гомеля. З 1995 старшыня Гомельскай абл. арг-цыі Бел. саюза мастакоў. Працуе ў галіне станковай графікі, акварэлі і жывапісу ў стылі мадэрн. Сярод твораў: графічныя серыі «Маё Палессе», «Мінск святочны» (абедзве 1986), «Ідалы» (1988); жывапісныя — «Утаймаванне кентаўра» (1994), «Анёл, які трымае лёсы» (1995), «Бітва кентаўраў» (1996), «Дваістасць» (1999), «Чарнобыльскі разлом» (2001), трыпціх «Адам і Ева» (2002) і інш.

СЯМЕ́НІКАЎ Іван Фёдаравіч (парт. псеўд. Паўлаў, Паўлуша, Густаў, Аркаша, Юрка; 11.9.1905, г. Віцебск — 9.4.1985), дзеяч рэв. руху ў Зах. Беларусі. З 1922 працаваў у паравозных майстэрнях Віцебска. У 1927—29 у Чырв. Арміі. У 1929—30 на камсам. і прафс. рабоце. З кастр. 1930 на падп. рабоце ў Зах. Беларусі: заг. ваен. аддзела ЦК, сакратар Віленскага акр. к-та, інструктар ЦК КПЗБ, у 1932—37 чл. ЦК, Сакратарыята ЦК КПЗБ. Дэлегат II з'езда КПЗБ (1935), VI з'езда Кампартыі Польшчы (1932). У 1937—56 неабгрунтавана рэпрэсіраваны, працаваў на Д. Усходзе. У 1956—57 на сав. рабоце ў Мінску.

СЯМЕ́НЧАНКА Віталь Паўлавіч (н. 22.1.1951, г.п. Парафіеўка Ічнянскага р-на Чарнігаўскай вобл., Украіна), бел. вучоны ў галіне гідрабіялогіі. Д-р біял. н. (1992). Скончыў БДУ (1973). З 1972 у Ін-це заалогіі АН Беларусі (з 2001 заг. лабараторыі). Навук. працы па структуры супольнасцяў, папуляцыйнай экалогіі зоапланктону.

Тв.: Биология и продукция ледниковых реликтовых ракообразных. Мн., 1986 (разам з Л.М.Сушчэнем, В.В.Вежнаўцом); Продукция планктонных ракообразных и факторы среды. Мн., 1990 (у сааўт.).



І.**Сямека**. «Дваістасць». 1999.

СЯМЕ́ЎСКІ Васіль Іванавіч (6.1.1849, г. Полацк Віцебскай вобл. — 4.10.1916), расійскі гісторык народніцкага кірунку, грамадскі дзеяч. Брат М.І.*Сямеўскага*. Праф. (1882), д-р рус. гісторыі (1889). Скончыў Пецярбургскі ун-т (1872), у 1882—86 у ім прыват-дацэнт. Вывучаў гісторыю сялянства 18—19 ст. і рабочага класа ў Расіі, вызв. рух дзекабрыстаў і петрашэўцаў. Адзін са стваральнікаў партыі нар. сацыялістаў (1906), чл. яе ЦК. У працах С. «Сяляне ў цараванне

імператрыцы Кацярыны II» (т. 1—2, 1881—1901), «Сялянскае пытанне ў Расіі ў XVIII і першай палавіне XIX ст.» (т. 1—2, 1888), «Рабочыя на сібірскіх залатых промыслах» (т. 1—2, 1898), «Палітычныя і грамадскія ідэі дзекабрыстаў» (1909), «М.В.Буташэвіч-Петрашэўскі і петрашэўцы» (ч. 1, 1922) багаты архіўны матэрыял. У 1913—16 адзін са стваральнікаў і рэдактар гіст.-літ. часопіса ліберальна-народніцкага кірунку «Голос минувшего». *Э.А.Карніловіч.*

СЯМЁЎСКІ Міхаіл Іванавіч (16.1.1837, с. Фядорцава Пскоўскай вобл., Расія — 21.3.1892), расійскі гісторык, публіцыст. Брат В.І.*Сямёўскага.* Тайны саветнік (1882). Скончыў Полацкі кадэцкі корпус (1852) і Дваранскі полк (Пецярбург, 1854). У 1857—61 на воен. службе. У 1863—82 на службе ў Дзярж. канцылярыі. У канцы 1850 — пач. 60-х г. супрацоўнічаў у выданнях Вольнай рус. друкарні (Лондан), сабраў вакол сябе гурток апазіцыйна настроеных асоб, быў пад наглядам «Трэцяга аддзялення». У 1870—92 рэд.-выдавец час. *«Русская старина».* З 1856 друкаваў свае артыкулы і нарысы па рас. гісторыі. Асн. твор — «Нарысы і апавяданні з рускай гісторыі XVIII ст.» (т. 1—3, 2-е выд., 1883—84). Выяўляў і друкаваў дакументы з правінцыяльных і сямейных архіваў, у т.л. мемуары А.Ц.*Болотава*, Я.П.Шахаўскога, *дзекабрыстаў* і інш.

Тв.: Тайная служба Петра I. Мн., 1993.

А.М.Лукашэвіч.

СЯМЁНАВА Ала (Альбіна Іванаўна; н. 9.8.1938, с. Бальшарэцкае Камчацкай вобл., Расія), бел. крытык, пісьменнік. Скончыла БДУ (1960). У 1960—86 працавала ў выд-вах «Навука і тэхніка», «Мастацкая літаратура», у 1987—94 заг. аддзела маст. крытыкі час. «Нёман». Друкуецца з 1966. Аўтар літ., лірычна-філас., настраёва-тэалагічных эсэ, артыкулаў пра бел. пісьменнікаў: А.Адамовіча, У.Арлова, Н.Арсенневу, Р.Барадуліна, В.Бечыка, Я.Брыля, А.Васілевіч, А.Вярцінскага, Л.Дранько-Майсюка, А.Дударава, А.Жука, С.Законнікава, В.Карамазава, У.Караткевіча, Х.Лялько, У.Някляева, А.Пісьмянкова, А.Разанава, Я.Саламевіча, М.Стральцова і інш., папу рымскага Яна Паўла II. У аповесці «Бэзавы попел» (1994) і апавяданнях — спробы паяднаць абстрагаваную думку з эмоцыяй, лейтматыў твораў абумовіць настроем думкі аўтара.

Тв.: Гарачы след таленту. Мн., 1979; Слова сапраўднага лад. Мн., 1986; Святло загадкі: Імпрэсіі і адлюстраванні. Мн., 1995.

Літ.: Стральцова В. Пошукі сучаснай аўтабіяграфічнай прозы // Literatura i języki słowian wschodnich. Opole, 1997; Васілевіч А. «Дзе прытулак душы тваёй?..» // Полымя. 1996. № 6. *А.В.Спрынчан.*

СЯМЁНАВА Кацярына Сямёнаўна (18.11.1786 — 13.3.1849), руская актрыса. Скончыла Пецярбургскае тэатр. вучылішча. У 1803—26 (з перапынкам) у пецярбургскім імператарскім т-ры. Эмацыянальнасць і шчырасць выканання С. праявілася ў трагедыях В.Озерава: Антыгона («Эдып у Афінах»), Моіна («Фінгал»), Ксенія («Дзмітрый Данскі»), Паліксена («Паліксена»). Самабытна трактавала жаночыя вобразы трагедый Расіна (Герміёна — «Андрамаха», Федра — «Федра»), Вальтэра (Меропа — «Меропа», Заіра — «Заіра»), І.Б.Ланжэп'ера (Медэя — «Медэя») і інш. Мастацтва С. вызначалася ўнутр. свабодай пачуццяў і адухоўленасцю.

Літ.: Медведева И.Н. Екатерина Семенова: Жизнь и творчество трагич. актрисы. М., 1964.

СЯМЁНАВА Людміла Пятроўна (н. 9.4.1944, г. Пенза, Расія), бел. канцэртмайстар. Засл. арт. Беларусі (1999). Скончыла Бел. кансерваторыю (1967). З 1966 канцэртмайстар Нац. акад. т-ра балета Беларусі, адначасова з 1970 артыстка аркестра творчага аб'яднання «Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь». У 1970—87 вяла канцэртную дзейнасць.

СЯМЁНАВА Марына Цімафееўна (н. 12.6.1908, С.-Пецярбург), расійская артыстка балета. Нар. арт. СССР (1975). Герой Сац. Працы (1988). Скончыла Ленінградскае харэагр. вучылішча (1925).



М.**Сямёнава** ў ролі Раймонды.

З 1925 у Ленінградскім т-ры оперы і балета, з 1930 у Вял. т-ры ў Маскве (з 1953 балетмайстар-рэпетытар), адначасова ў 1954—60 педагог Маскоўскага харэагр. вучылішча. Яе мастацтву ўласцівы віртуознасць, пластычная выразнасць поз; гарманічна спалучала гераіка-трагедыйны і лірыка-камедыйны пачатак. Праславілася як выканаўца вядучых партый у балетах класічнага рэпертуару: Нікія («Баядэрка» Л.Мінкуса), рынцэса Фларына («Спячая прыгажуня» П.Чайкоўскага), Жызэль («Жызэль» А.Адана), Раймонда («Раймонда» А.Глазунова) і інш. Дзярж. прэмія СССР 1941.

СЯМЁНАВІЧЫ, вёска ў Уздзенскім р-не Мінскай вобл., на р. Уса, каля аўтадарогі Узда—Магільна. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 6 км на ПдЗ ад г. Узда, 80 км ад Мінска, 28 км ад чыг. ст. Нёгарэлае. 314 ж., 142 двары (2002). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Ва ўсх. ч. вёскі селішча 16—17 ст.

СЯМЁНАЎ Аляксей Фадзеевіч (6.4.1921, г. Бабруйск Магілёўскай вобл. — 8.5.1951), поўны кавалер ордэна Славы. У Вял. Айч. вайну з 1944 на Карэльскім фронце. Камандзір аддз. сапёрнага батальёна сяржант С. вызначыўся ў ліп., вер. і кастр. 1944 на тэр. Карэліі, дзе ў складзе атрада абясшкодзіў больш за 1 тыс. мін праціўніка.

СЯМЁНАЎ Андрэй Лявонцьевіч (25.10.1900, с. Юрэнева Вяземскага р-на Смаленскай вобл., Расія — 11.2.1982), бел. вучоны ў галіне селекцыі і насенняводства с.-г. культур. Д-р с.-г. н. (1958), праф. (1961). Засл. дз. нав. Беларусі (1975). Скончыў БСГА (1925). З 1950 у Бел. НДІ земляробства (да 1976 заг. аддзелаў). Навук. працы па селекцыі і насенняводстве шматгадовых траў. Распрацаваў методыку селекцыі траў на аснове біятыпічнага адбору. Сааўтар сартоў канюшыны Цудоўная, Волат, Красавік, люцэрны пасяўной Беларуская, аўсяніцы лугавой Зорка, купкоўкі зборнай Магутная, райграсу Пашавы і інш.

Тв.: Семеноводство многолетних трав. 2 изд. Мн., 1975 (разам з К.С.Уласавай).

СЯМЁНАЎ Валерый Міхайлавіч (н. 30.10.1956, г. Віцебск), бел. вучоны ў галіне інфекц. хвароб. Д-р мед. н. (1990), праф. (1997). Скончыў Віцебскі мед. ін-т (1980), дзе і працуе (з 1998 заг. кафедры). Навук. працы па рацыянальных метадах лячэння хворых з інфекц. паталогіяй. Прэмія Ленінскага камсамола Беларусі 1985.

Тв.: Краснушная инфекция. Мн., 1994 (разам з А.А.Астапавым, Т.І.Дзмітрачэнка); Хламідійная инфекция. Смоленск, 1997 (разам з М.К.Нікіфаравым, А.В.Томчынай); Сальмонеллез: Клинико-эпидемиол. и микробиол. аспекты терапии. Витебск, 2001 (разам з Т.І.Дзмітрачэнка).

СЯМЁНАЎ Георгій Віталевіч (12.1.1931, Масква — 30.4.1992), рускі пісьменнік. Скончыў Літ. ін-т імя М.Горкага ў Маскве (1960). Друкаваўся з 1961. У зб-ках «Сорак чатыры начы» (1964), «Лебедзі і снег» (1964), «Поўня звініць» (1968), «Увечары, пасля дажджу» (1969), «Блакітны дым» (1979, Дзярж. прэмія Расіі 1981), «Розум лісіцы» (1986) і інш. лірычныя апавяданні і аповесці пра сучаснасць. Аўтар рамана «Вольная вывучка» (1976) і інш. Некат. яго апавяданні на бел. мову пераклалі А.Жук, А.Звонак, Т.Мартыненка.

Тв.: Избранное: Рассказы (1962—1982). М., 1983; Фригийские васильки, новеллы и по-

весть. М., 1980; Городской пейзаж: Повесть и рассказы. М., 1985; Чертово колесо: Роман, рассказы. М., 1989.

СЯМЁНАЎ Георгій Мінавіч (1908, Мінск — 7.5.1942), адзін з арганізатараў і кіраўнікоў *Мінскага патрыятычнага падполля* ў Вял. Айч. вайну. У пач. вайны на фронце, з акружэння трапіў у Мінск. У жн. 1941 удзельнічаў у стварэнні падп. групы, у ліст. — снеж. на яго кватэры адбылася нарада прадстаўнікоў падп. арг-цый горада, створаны падп. гарком КП(б)Б; абраны чл. і заг. ваен. аддзела гаркома. Стварыў падп. арг-цыю вуліц К.Лібкнехта і Р.Люксембург. У сак. 1942 арыштаваны акупантамі і пасля катаванняў павешаны.

СЯМЁНАЎ Глеб Сяргеевіч (18.4.1918, С.-Пецярбург — 23.1.1982), рускі паэт, перакладчык. Скончыў Ленінградскі ун-т. Друкаваўся з 1935. У паэт. зб-ках «Святло ў вокнах» (1947), «Плячо ў плячо» (1952), «Адпачынак у верасні» (1964), «Сосны» (1972) і інш. роздум пра радзіму, апяванне рус. прыроды, боль-успамін пра ленінградскую блакаду. Пераклаў каля 50 твораў Я.Купалы. У перакладзе С. многія вершы Я.Купалы загучалі ўпершыню на рус. мове. Яго пераклады перадаюць не толькі змест і форму, але і інтанацыі, маст. своеасаблівасць паэзіі бел. паэта.

Тв.: Стихотворения. Л., 1979; Прощание с осенним садом: Стихи. Л., 1986.

СЯМЁНАЎ Дзмітрый Дзмітрыевіч (3.1.1835, в. Асінаўка Віцебскага р-на — 21.3.1902), бел. і рас. педагог. Скончыў Віцебскую гімназію (1852), настаўніцкія курсы Пецярбургскага ун-та (1859). З 1852 выкладаў рус. мову, геаграфію і гісторыю ў віцебскіх яўр. чатырохкласным і гандл.-прамысл. вучылішчах. З 1857 у Пецярбургу: выкладаў у гімназіі, у жаночым Марыінскім вучылішчы, у 1860—62 у Смольным ін-це, з 1865 на Вышэйшых пед. курсах пры 2-й Пецярбургскай ваен. гімназіі. З 1873 дырэктар Кубанскай, з 1878 — Закаўказскай семінарый. З 1883 інспектар па навуч. частцы вучылішчнага к-та Пецярбургскай гар. думы, адначасова ў 1888—91 рэдагаваў час. «Детское чтение». Выступаў за ўсеагульную пач. адукацыю і распаўсюджванне пісьменнасці ў народзе. Распрацаваў методыкі выкладання рус. мовы і геаграфіі. Аўтар першых рус. наглядных дапаможнікаў для гімназій «Свет у карцінках» (1866), «Дар слова» (1868), геагр. хрэстаматыі «Айчынаznаўства» (т. 1—6, 1864—69) і шэрагу прац па гісторыі адукацыі.

Тв.: Избр. пед. соч. М., 1953.

Літ.: Макаев В.В. Жизнь и педагогическая деятельность Д.Д.Семенова. Тбилиси, 1956. *І.М.Шаруха.*

СЯМЁНАЎ (мянушка Куцень) Максім, бел. майстар сярэбраных спраў 2-й пал. 17 ст. Паходзіў з г.п. Копысь (Аршанскі р-н Віцебскай вобл.). Працаваў у Сярэбранай палаце Маскоўскага Крамля як чаканшчык і майстар чэрневай справы. Сярод работ: рэльефныя абклады абразоў, праразныя кадзілы, сярэбраны і медны посуд; магчыма, зрабіў сярэбраны ківот для палат царэўны Наталлі Аляксееўны.

СЯМЁНАЎ Мікалай Мікалаевіч (15.6.1896, г. Саратаў, Расія — 25.9.1986), савецкі фізік і фізікахімік; адзін з заснавальнікаў хім. фізікі, заснавальнік навук. школы. Акад. АН СССР (1932, чл.-кар. 1929). Двойчы Герой Сац. Працы (1966, 1976). Скончыў Петраградскі ун-т (1917). У 1920—31 у Ленінградскім фіз.-тэхн. ін-це. З 1931 дырэктар Ін-та хім. фізікі АН СССР. Адначасова праф. Ленінградскага політэхн. ін-та (з 1928) і



М.М.**Сямёнаў**.



Ю.П.**Сямёнаў**.

Маскоўскага ун-та (з 1944). У 1957—71 акад.-сакратар Аддз. хім. навук, у 1963—71 віцэ-прэзідэнт АН СССР. З 1981 гал. рэдактар журнала «Химическая физика». Навук. працы па хім. фізіцы, хім. кінетыцы, тэорыі гарэння і выбуху, каталізе. Распрацаваў тэорыю цеплавога выбуху газавых сумесей. Адкрыў разгалінаваныя ланцуговыя рэакцыі (1926—28) і з'яву ланцуговага ўзгарання. Стварыў агульную колькасную тэорыю ланцуговых рэакцый (1930—34), паказаў іх распаўсюджанасць у хіміі (гл. *Ланцуговыя хімічныя рэакцыі*). Устанавіў механізм многіх складаных ланцуговых рэакцый, даследаваў уласцівасці свабодных атамаў і радыкалаў, што ўдзельнічаюць у элементарных стадыях ланцуговых працэсаў. Развіў ланцуговую тэорыю гетэрагеннага каталізу (разам з У.У.*Ваяводскім*, Ф.Ф.Валькенштэйнам). Дзярж. прэміі СССР 1941, 1949. Нобелеўская прэмія 1956 (разам з С.Н.*Хіншэлвудам*). Ленінская прэмія 1976. Яго імем названы Ін-т хім. фізікі Рас. АН.

Тв.: Наука и общество: Статьи и речи. 2 изд. М., 1981; Цепные реакции. 2 изд. М., 1986.

Літ.: Н.Н.Семенов, 1896—1986. 3 изд. М., 1990; Воспоминания об академике Н.Н.Семенове. М., 1993.

СЯМЁНАЎ Уладзілен Рыгоравіч (н. 12.11.1932, г. Самара, Расія), расійскі артыст балета, педагог. Нар. арт. СССР (1983). Скончыў Ленінградскае харэаграфічнае вучылішча (1950; з 1962 педагог). У 1950—72 саліст, з 1972 — балет-майстар-рэпетытар і педагог Марыінскага т-ра ў С.-Пецярбургу. Лірычны танцоўшчык з лёгкім скачком, майстар падтрымкі. Сярод партый: Зігфрыд, Дзірэ, Прынц («Лебядзінае возера», «Спячая прыгажуня», «Шчаўкунок» П.Чайкоўскага), Жан дэ Брыен («Раймонда» А.Глазунова) і інш.

СЯМЁНАЎ Юліян Сямёнавіч (8.10.1931, Масква — 5.9.1993), рускі пісьменнік. Засл. дз. маст. Расіі (1982). Скончыў Ін-т усходазнаўства (1953). Друкаваўся з 1958. Раманы «Пароль не патрэбны» (1965), «Маёр Віхар» (1966—67), «Семнаццаць імгненняў вясны» (1969; аднайм. тэлефільм, 12 сер., 1973; Дзярж. прэмія Расіі 1976), «Брыльянты для дыктатуры пралетарыяту» (1971), «Гарэнне» (1977—78), «Прэс-цэнтр» (1984), «Экспансія» (кн. 1—3, 1985—87), аповесці «Пры выкананні службовых абавязкаў» (1962), «Пятроўка, 38» (1963), «Агарова, 6» (1972), «ТАСС упаўнаважаны заявіць» (1979), «Загадана выжыць» (1983), хроніка «Альтэрнатыва» (1974) і інш. — вострасюжэтныя паліт. дэтэктывы. Аўтар п'ес «Ідзі і не бойся» (1963), «Шаша на Вялікую Мядзведзіцу» (1964), «Шыфроўка для Блюхера» (1966), кінасцэнарыяў (пераважна па сваіх творах), навел, нарысаў, публіцыст. артыкулаў. Большасць твораў С. экранізавана. У т-рах Беларусі ставіліся п'есы С.: «Семнаццаць імгненняў вясны» (у сааўт. з У.Токаравым) — у Бел. т-ры імя Я.Коласа, Гомельскім і Брэсцкім абл. драм. т-рах (усе 1970); «Пятроўка, 38» — у Гродзенскім абл. драм. (1964); «Правакацыя» — у Гомельскім (1969) т-рах.

Тв.: Собр. соч. Т. 1—5. М., 1983—84; Альтернатива: Политич. хроники. Кн. 1—4. М., 1975—78.

СЯМЁНАЎ Юрый Паўлавіч (н. 20.4.1935, г. Таропец Цвярской вобл., Расія), расійскі вучоны ў галіне ракетна-касм. тэхнікі. Акад. Рас. АН (2000, чл.-кар. 1987). Герой Сац. Працы (1976). Скончыў Днепрапятроўскі ун-т (1958). Працаваў у КБ М.К.*Янгеля*. З 1964 у КБ С.П.*Каралёва*. З 1989 гал. канструктар, з 1991 ген. дырэктар НВА «Энергія». З 1994 прэзідэнт і гал. канструктар ракетна-касм. карпарацыі «Энергія». Кіраўнік рас. часткі работ па стварэнні Міжнар. касм. станцыі. Навук. працы па касм. тэхніцы і энергетыцы пілатуемых касм. комплексаў. Удзельнічаў у стварэнні касм. апаратаў для даследавання Месяца, арбітальных станцый і пілатуемых касм. караблёў для працяглых палётаў. Узначальваў работы па стварэнні касм. карабля шматразовага выкарыстання «*Буран*». Ленінская прэмія 1978. Дзярж. прэмія СССР 1985. Залаты медаль імя К.Э.Цыялкоўскага АН СССР (1987).

Тв.: Новые российские технологии в ракетно-космической технике последних лет // Вестн. РАН. 2000. Т. 70, № 8. *У.С.Ларыёнаў.*

СЯМЁНАЎ Яўген Мікалаевіч (н. 10.1.1933, С.-Пецярбург), бел. мастак. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1965). З 1965 працаваў мастаком-дэкаратарам на кінастудыі «Беларусьфільм», з 1969 выкладаў у Бел. тэатр.-маст. ін-це. У 1995—2001 жыў у Канадзе. Працуе пе-

раважна ў жанрах пейзажа і партрэта. Творам уласцівы глыбіня перспектыўнай пабудовы кампазіцыі, адзінства каларыту, лірычнасць і маляўнічасць колеравага ладу: «Камсамольцы 30-х гадоў» (1970), «Салдаты», «Даяркі» (абодва 1975), «Зялёны Луг-5», «Ветэран міліцыі М.Ф.Мананка», «Дарога на Маладзечна» (усе 1978), «Зерняток» (1979), «Я.Кучыц» (1981), «У.Е.Лабанок сярод баявых сяброў» (1986), «Пейзаж» (1998—99), партрэты акадэмікаў Г.В.Багамолава, А.І.Булыгіна (2001) і інш. Выканаў дыярамы для Музея гісторыі і культуры Беларусі ў Мінску і краязнаўчага музея ў г. Мазыр.

СЯМЁНАЎ Яфім Яўстаф'евіч (н. 26.1.1932, с. Малая Лая Прыгараднага р-на Свярдлоўскай вобл., Расія), бел. матэматык і педагог. Канд. пед. н. (1976), праф. (1991). Скончыў Ніжнетагільскі пед. ін-т (1958), дзе і працаваў. З 1980 у Віцебскім ун-це. Навук. працы па праблемах метадалогіі і методыкі дыялагічнага выкладання матэматыкі. Аўтар навуч. дапаможнікаў для агульнаадукацыйных школ.

Тв.: Изучаем геометрию. М., 1987; Учимся рассуждать и доказывать. М., 1989 (разам з І.Л.Нікольскай); За страницами учебника геометрии. 2 изд. М., 1999.

СЯМЁНАЎСКІ ПОЛК, старэйшы полк рус. гвардыі. Сфарміраваны Пятром I у канцы 17 ст. з *«пацешных» войск* у с. Сямёнаўскае пад Масквой (адсюль назва). Вызначыўся ў *Паўночнай вайне 1700—21*, войнах з Турцыяй 1735—39 і 1877—78, *вайне 1812*, замежных паходах 1813—14. У 1820 адбылося выступленне салдат супраць нялюдскага абыходжання камандзіра палка з падначаленымі. Полк расфарміраваны, каля тыс. чал. панеслі розныя пакаранні. Пасля быў створаны новы С.п. з салдат грэнадзёрскіх палкоў. Некат. б. сямёнаўцы ўдзельнічалі ў паўстанні дзекабрыстаў 1825. У 1917 радавы склад С.п. падтрымаў Люты і Кастр. рэвалюцыі. У пач. 1918 С.п. расфарміраваны. Значная колькасць афіцэраў працягвала службу ў белагвардзейскіх войсках. Гл. таксама *Гвардыя*.

СЯМЁНАЎ-ЦЯН-ШАНСКІ (да 1906 Сямёнаў) Пётр Пятровіч (14.1.1827, с.Урусава Чаплыгінскага р-на Ліпецкай вобл., Расія — 11.3.1914), расійскі географ, падарожнік, статыстык, батанік, энтамолаг, дзярж. і грамадскі дзеяч. Ганаровы чл. Пецярбургскай АН (1873). Скончыў Пецярбургскі ун-т (1848). З 1849 удзельнічаў у рабоце Рус. геагр. т-ва (з 1873 віцэ-старшыня). У 1856—57 даследаваў паўн. і цэнтр. раёны Цянь-Шаня, вывучаў іх геал. будову, рэльеф, вышынную пояснасць, ледавікі, сабраў калекцыі мінералаў і насякомых, гербарый, каштоўны этнагр. матэрыял. За навук. даследаванні атрымаў дадатковае прозвішча Цян-Шанскі. Па яго ініцыятыве Сярэднюю і Цэнтр. Азію даследавалі шматлікія рас. геагр. экспедыцыі М.М.*Пржавальскага*, Р.М.*Патаніна*, П.А.*Крапоткіна* і інш. З 1864 дырэктар Цэнтр. стат. камітэта, у 1874—97 старшыня стат. савета, адзін з арганізатараў усерас. перапісу насельніцтва ў 1897. Кіраваў выданнямі: «Геаграфічна-статыстычны слоўнік Расійскай імперыі» (т. 1—5, 1863—85); «Расія. Поўнае геаграфічнае апісанне нашай айчыны» (т. 1—19, 1899—1914; т. 9 — Верхняе Падняпроўе і Беларусь, 1905); «Маляўнічая Расія» (т. 1—12, 1881—95; т. 3, ч. 1 — Літоўскае Палессе, ч. 2 — Беларускае Палессе, 1882). Чл. Дзярж. савета (з 1897), многіх рас. і замежных навук. т-ваў. Яго імем названы хрыбет у Наньшані, ледавік і пік на Цянь-Шані, гара ў Алтаі, горы на Алясцы і Шпіцбергене, каля 100 новых форм раслін і жывёл; у 1899 Рус. геагр. т-ва ўстанавіла залаты медаль яго імя.



П.П.**Сямёнаў-Цян-Шанскі**.

СЯМЁНЕНКІ, возера ў Расонскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Дрыса, за 17 км на ПдУ ад г.п. Расоны. Пл. 0,25 км^2, даўж. 1,4 км, найб. шыр. 320 м, найб. глыб. 2,2 м, даўж. берагавой лініі каля 4 км, пл. вадазбору 7,2 км^2. Катлавіна лагчыннага тыпу. Схілы на Пд і Пн выш. да 1 м, на З і У 6—8 м, параслі лесам. Берагі нізкія, забалочаныя, пад хмызняком, на Пн і Пд утвараюць вузкія залівы. Дно выслана сапрапелем, участкамі каля берагоў пясчанае. Зарастае ўздоўж берагоў на шыр. да 15 м, да глыб. 1,5 м. Упадаюць 2 ручаі, выцякае ручай у воз. Межна.

«СЯМІБАЯРШЧЫНА», баярскі ўрад у Расіі, створаны пасля адлучэння ад пасады 27.7.1610 цара *Васіля Іванавіча Шуйскага*. У яго склад увайшлі 7 чал. (адсюль назва): кн. Ф.І.Мсціслаўскі, І.М.Варатынскі, А.В.Трубяцкой, А.В.Галіцын, Б.М.Лыкаў, баяры І.Н.Раманаў, Ф.І.Шарамецеў. Баючыся антыфеад. руху, урад «С.» заключыў 27.8.1610 дагавор з гетманам С.*Жалкеўскім* аб прызнанні рус. царом каралевіча Уладзіслава (гл. *Уладзіслаў IV*). 1.10.1610 «С.» патаемна пусціла польска-літ. войскі ў Маскву і фактычна перадала ўладу ў рукі кіраўніцкой акупац. гарнізона (гл. *Вайна Рэчы Паспалітай з Расіяй 1609—18, «Смута»*). «С.» існавала (намінальна) да вызвалення Масквы 2-м апалчэннем (гл. *Народнае апалчэнне 1612*) пад кіраўніцтвам К.М.*Мініна* і Дз.М.*Пажарскага*. Земскі сабор 3.3.1613 выбраў царом *Міхаіла Фёдаравіча* Раманава.

СЯМІГАДО́ВАЯ ВАЙНА́ 1756—63, вайна паміж Аўстрыяй, Францыяй, Расіяй, Іспаніяй, Саксоніяй, Швецыяй з аднаго боку і Прусіяй, Вялікабрытаніяй, Партугаліяй, Гановерам і некат. інш. паўн.-герм. дзяржавамі — з другога; вынік барацьбы Вялікабрытаніі з Францыяй за калоніі ў Паўн. Амерыцы і Ост-Індыі і сутыкнення агрэсіўнай палітыкі Прусіі з інтарэсамі Аўстрыі і Расіі. У студз. 1756 Прусія і Вялікабрытанія заключылі Уайтхолскі саюзны дагавор, у маі 1756 Аўстрыя ўвайшла ў саюз з Францыяй. Англа-пруская збліжэнне прымусіла Расію адмовіцца ад арыентацыі на Вялікабрытанію і ў студз. 1757 далучыцца да саюза Аўстрыі з Францыяй. *Фрыдрых II* перш за ўсё імкнуўся захапіць Саксонію (яе курфюрст Фрыдрых Аўгуст II — адначасова кароль Рэчы Паспалітай *Аўгуст III*) і абмяняць яе на Багемію (Чэхія), а таксама паставіць Рэч Паспалітую ў васальную залежнасць ад Прусіі. Аўстрыя хацела вярнуць *Сілезію*, якую захапіла Прусія ў выніку вайны за *аўстрыйскую спадчыну* ў 1740—48; Францыя планавала захапіць Гановер, а Швецыя — прускую *Памеранію*. Расія мела на мэце прыпыніць экспансію Прусіі на У і пашырыць свае граніцы на З, пры гэтым Расія абумовіла свой няўдзел у вайне супраць Вялікабрытаніі. У жн. 1756 прускія войскі ўварваліся ў Саксонію, у вер. — у Аўстрыю. У 1756 да аўстра-франц. блока далучылася большасць дзяржаў «Свяшчэннай Рым. імперыі», у 1757 — Швецыя. У пач. вайны прускія войскі атрымалі перамогу над аўстр. арміяй каля Прагі (6.5.1757), але пацярпелі няўдачу каля Коліна (18.6.1757) і былі разгромлены рас. войскамі каля Гросс-Егерсдорфа (30.8.1757). Новыя перамогі прускага караля Фрыдрыха II над французамі пад Росбахам (5.11.1757) і аўстрыйцамі каля Лейтэна (5.12.1757) страцілі значэнне пасля перамогі рас. арміі ва Усх. Прусіі, дзе прускія войскі здалі Тыльзіт і Кёнігсберг (студз. 1758). У жн. 1759 рас. армія пры ўдзеле аўстр. войск разбіла прускія войскі каля Кунерсдорфа. У кастр. 1760 рас. войскі ўвайшлі ў Берлін. Аднак Фрыдрых II, скарыстаўшы нерашучасць у ваен. дзеяннях Аўстрыі, нанёс паражэнне яе войскам каля Торгаў (3.11.1760). У 1761 на баку Францыі выступіла Іспанія, а да Вялікабрытаніі прымкнула Партугалія. У снеж. 1761 рас. корпус ген. П.А.Румянцава (гл. *Румянцаў-Задунайскі*) атрымаў перамогу пад Кольбергам. Рас. армія замацавалася ў Памераніі і пагражала Брандэнбургу. Ад поўнага разгрому Прусію выратавалі супярэчнасці ў стане антыпрускай кааліцыі, а таксама смерць рас. імператрыцы *Лізаветы Пятроўны* (5.1.1762) і прыход да ўлады імператара *Пятра III*, які заключыў саюзны дагавор з Прусіяй (5.5.1762). Пасля дварцовага пераварота (ліп. 1762) рас. царыца *Кацярына II* разарвала саюз з Прусіяй, аднак вайну не аднавіла. Вялікабрытанія амаль не ўдзельнічала ў ваен. дзеяннях у Еўропе (яна субсідзіравала Прусію),

вяла барацьбу з Францыяй на моры і ў калоніях. У 1762 з вайны выйшла Швецыя, спыніліся ваен. дзеянні паміж Прусіяй і Францыяй, Францыяй і Вялікабрытаніяй. Паводле Губертусбургскага міру 1763 паміж Аўстрыяй і Саксоніяй Прусія замацавала за сабой Сілезію і графства Глац. Паводле *Парыжскага мірнага дагавора 1763* да Вялікабрытаніі ад Францыі адышлі Канада, Усх. Луізіяна, Фларыда і большая частка франц. уладанняў у Індыі. Гал. вынікам С.в. была перамога Вялікабрытаніі над Францыяй у барацьбе за каланіяльнае і гандл. першынство, за дамінаванне на моры. І хоць паліт. карта Еўропы значна не змянілася, вайна істотна паўплывала на суадносіны сіл яе ўдзельнікаў. Эканам. заняпад і ваен. слабасць паскорылі крызіс абсалютызму ў Францыі і пачатак *Французскай рэвалюцыі 1789—99*. Аўстрыя стала саюзніцай Расіі ў барацьбе супраць Турцыі. С.в. была першым крокам да гегемоніі Прусіі ў Германіі, спрыяла росту паліт. ўплыву Расіі ў Еўропе. Тэр. Беларусі ў ходзе вайны была тылам рас. войск, якія рабілі тут рэквізіцыі і набіралі рэкрутаў.

Літ.: Архенгольц И.В. История семилетней войны: Пер. с нем. М., 2001.

Ю.В.Бажэнаў, В.А.Юшкевіч.

СЯМІЗО́РАВА Ніна Львоўна (н. 15.10.1956, г. Крывы Рог, Украіна), расійская балерына. Засл. арт. Украіны (1977). Нар. арт. Расіі (1985). Скончыла Кіеўскае харэаграфічнае вучылішча



Н.**Сямізорава** ў ролі Аўроры.

(1975). З 1975 у Кіеўскім т-ры оперы і балета імя Шаўчэнкі, з 1978 — у Вял. т-ры ў Маскве. Танец С. вылучаецца чысцінёй ліній, дакладнасцю малюнка, маштабнасцю рухаў. Першая выканаўца партый Феі («Драўляны прынц» Б.Бартака), Розы («Маленькі прынц» Я.Глебава), Дульцынеі, Альдонсы («Рыцар журботнага вобраза» Р.Штрауса). Сярод інш.: Адэта — Адылія, Аўрора («Лебядзінае возера», «Спячая прыгажуня» П.Чайкоўскага), Мехменэ Бану («Легенда аб каханні» А.Мелікава), Фрыгія, Эгіна («Спартак» А.Хачатурана). Лаўрэат Міжнар. конкурсу артыстаў балета (1977, Масква).

СЯМІПАЛА́ЦІНСК, горад, цэнтр Сяміпалацінскай вобл. Казахстана. Засн. ў 1718 як крэпасць, на сучасным месцы з 1776, горад з 1782. Каля 350 тыс. ж. (2001). Вузел чыгунак і аўтадарог, порт на р. Іртыш. Прам-сць: харч., лёгкая (трыкат., гарбарна-абутковая), маш.-буд. і металаапр. (з-ды: «Казкабель», суднарамонтна-суднабуд., газавай апаратуры, арматурны і інш.). Камбінаты: металаапр., горнаабагачальны «Алтайзолата» і інш. 4 ВНУ. 2 тэатры. Краязнаўчы музей. Літ.-мемарыяльныя музеі Ф.М.*Дастаеўскага* і *Абая Кунанбаева*. У раёне С. былы палігон падземных выпрабаванняў ядз. зброі (спынены ў 1991).

СЯМІРАДКО́ЎЕ, септыма, сямірадковая страфа з адной, дзвюма або трыма рыфмамі і рознай схемай рыфмоўкі (ааБввБв, аБаБввБ, ааБвваБ, ААББВВБ і інш.):

Пануй, Мікалае,
Часіна такая,
Трымайся прастола,
А будзе вас гола.
Закончан малебен.
Ты нам не патрэбен,
Другі і апошні Мікола!
(Я.Колас. «Малебен»)

Да С. часта звяртаецца Н.Гілевіч.

В.П.Рагойша.

СЯМІРЭ́ЧЧА, паўднёва-ўсходняя частка Казахстана паміж азёрамі Балхаш на Пн, Сасыкколь і Алаколь на ПнУ, хрыбтом *Джунгарскі Алатау* на ПдУ, хрыбтамі Паўн. *Цянь-Шаня* на Пд. Назва ад 7 рэк гэтага раёна: Ілі, Каратал, Біен, Аксу, Лепса, Баскан, Сарканд. Ужываецца таксама каз. назва Джэтысу (ад каз. жэты — сем і су — вада). На ПнЗ і Пн, у раўніннай частцы пашыраны пясчаныя, часткова саланчаковыя пустыні і лугава-тугайныя ландшафты ўздоўж рэк. На ПдУ у перадгор'ях да выш. 2000 м — лісцевыя лясы, вышэй — яловыя лясы і альпійскія лугі. У пустынях развіта жывёлагадоўля (мясная авечкагадоўля і каракуляводства), на арашальных землях ўздоўж рэк вырошчваюць збожжа і тэхн. культуры, каля г. Алматы (гал. прамысл. цэнтр) — прыгарадная гаспадарка і садоўніцтва.

Як гіст. вобласць уключае і даліну р. Чу. У старажытнасці С. насялялі плямёны сакаў (1-е тыс. да н.э.), усуняў (2 ст. да н.э. — 5 ст. н.э.). У сярэдзіне 6 ст. тут утварыўся Зах.-Цюркскі каганат (гл. *Цюркскі каганат*), у 8 ст. — дзяржавы цюргешаў (да 758) і карлукаў (з 766). З канца 10 ст. С. ў складзе *Караханідаў дзяржавы*, каля 1140—1213 — *Каракітаяў дзяржавы*. У 1218—20 заваявана мангола-татарамі. У 16 ст. на тэр. С. ўтварыўся каз. Старэйшы жуз, які ў 1840—60-я г. далучаны да Рас. імперыі. У 1867 у складзе Туркестанскага ген.-губернатарства ўтворана Сямірэчанская вобл. з цэнтрам у г. Верны (цяпер *Алматы*). Адбывалася каланізацыя краю рас. казакамі і сялянамі-перасяленцамі, у 1867—1920 існавала Сямірэчанскае казацкае войска. У 1918—24 Сямірэчанская (з 1922 Джэтысуйская) вобл. у Туркестанскай АССР (у складзе РСФСР). У выніку нац.-дзярж. пераўтварэнняў 1924—36 тэр. С. далучана да Казахстана (большая ч.) і Кіргізіі.

СЯМКО́ВІЧ (Semkowicz) Уладзіслаў Аляксандр (8.5.1878, г. Львоў, Украіна — 19.2.1949), польскі гісторык. Правадз. чл. Польск. АН у Кракаве (1923), д-р габілітаваны (1909), праф. звычайны (1919). Скончыў Львоўскі ун-т (1903) і выкладаў у ім. У 1916—39 праф. Кракаўскага ун-та. У 1939—40 зняволены фашыстамі ў канцлагеры Заксенгаўзен. У 1945—47 дырэктар аддзела Польск. АН. Вывучаў генеалогію, геральдыку, сфрагістыку, палеаграфію, гіст. геаграфію і картаграфію феад. Польшчы і ВКЛ. Выдаў *«Акты уніі Польшчы з Літвою 1385—1791»* (з С.Кутшэбам), *«Дыпламатычны кодэкс кафедральнага сабора і Віленскай дыяцэзіі»* (з Я.Фіялкам).

СЯМКО́ЎСКІ Сямён Юльевіч (сапр. Бранштэйн; 15.3.1882, г. Магілёў — 18.3.1937), украінскі філосаф. Акад. АН Украіны (1929). З 1901 удзельнічаў у сац.-дэмакр. руху. Выступаў з пазіцыі меншавікоў-ліквідатараў; у перыяд 1-й сусв. вайны 1914—18 — цэнтрыст. Пасля вяртання ў 1917 з эміграцыі ў Расію ўвайшоў у склад меншавіцкага ЦК. З 1918 жыў на Украіне. У 1920 адышоў ад паліт. дзейнасці. Асн. праца «Дыялектычны матэрыялізм і прынцып адноснасці» (1926).

СЯМЫ́НІН Пётр Андрэевіч (12.7.1909, г. Варонеж, Расія — 22.1.1983), рускі паэт, перакладчык. Працаваў у газетах Сібіры і Поўначы. Друкаваўся з 1928. Аўтар аўтабіягр. паэм «Пачатак дня» (1958), «Добры бераг», «Першае лета» (абедзве 1961), «Ланцуг Праметэя», «Апошняе лета» (абедзве 1965); кніг паэзіі «Блізкасць неба» (1962), «У складаным і простым» (1968). На рус. мову пераклаў асобныя вершы, урыўкі з паэм «Адплата», «Новая зямля» (раздзел «Дзядзька ў Вільні»), «Рыбакова хата» (главы «У панскай няволі», «Вызваленне»; з С.Гарадзецкім) Я.Коласа, вершы Ф.Багушэвіча, М.Багдановіча, П.Броўкі, М.Танка, П.Панчанкі, М.Лужаніна. Перакладаў з укр., серб. і інш. моў.

Тв.: Избранное. М., 1983.

СЯМ'Я́, заснаваная на шлюбе ці кроўна-сваяцкіх адносінах малая група людзей, члены якой звязаны агульнасцю побыту, узаемнай дапамогай, маральнай і прававой адказнасцю. Асн. функцыі С. — рэпрадукцыйная (нараджэнне дзяцей), выхаваўчая (гл. *Сямейнае выхаванне*), гасп.-бытавая, эканам., рэкрэактыўная (узаемадапамога, падтрыманне здароўя, арганізацыя вольнага часу і

інш.), камунікатыўная і рэгулятыўная (кантроль і рэгламентацыя паводзін членаў С., яе аўтарытэт). Структура С. вызначаецца сістэмай узаемаадносін паміж яе членамі (бацькі, дзеці, муж, жонка і інш.) і яе складам: колькасць членаў, пакаленняў, шлюбных пар, дзетнасць, ступень і характар сваяцтва (прамое, бакавое і інш.). У залежнасці ад характару шлюбных саюзаў вылучаюцца С. палігамныя (гл. *Палігамія*), парныя (няўстоліві саюз мужа і жонкі), манагамныя (гл. *Манагамія*). У залежнасці ад колькасці шлюбных пар і характару вядзення гаспадаркі вылучаюць 2 формы С. — нераздзеленая і малая. Да нераздзеленых адносяцца С., у якіх жывуць і вядуць гаспадарку некалькі шлюбных пар. У залежнасці ад сваяцтва іх падзяляюць на бацькоўскія (разам жывуць 2 ці больш жанатых сыноў) і брацкія (сумесна жывуць 2 і больш жанатых братоў). У залежнасці ад пакаленнага складу вызначаюцца адналінейныя (бацькі і адзін жанаты сын, унукі) і многалінейныя (бацькі і 2 ці больш жанатых сыноў або 2 і больш братоў са сваімі сем'ямі). Да малой С. адносяцца нуклеарныя (шлюбная пара з дзецьмі ці без іх) і складаныя (акрамя шлюбнай пары і дзяцей пражывае адзін з бацькоў ці інш. сваякоў).

Да сярэдзіны 19 ст. на Беларусі пераважалі нераздзеленыя С. З канца 19 ст. пераважаюць малыя С. Паменшылася колькасць С. з 6—10 чалавек і павялічылася іх колькасць з 2—5 чалавек. Формай С. вызначаліся і ўнутрысямейныя адносіны. Паводле звычаёвага права на чале С. стаяў старэйшы ў С. мужчына; у бацькоўскай С. гэта быў бацька, у брацкай — старэйшы з братоў. Галава С. адказваў за арганізацыю гасп. дзейнасці і сямейнага побыту, за падатковыя выплаты і інш. Малую С. ўзначальваў муж. Ва ўнутрысямейных адносінах важную ролю адыгрывала жанчына; у бацькоўскай С. гаспадыняй была маці (свякруха), у брацкай — жонка старэйшага брата. Яна кіравала жанчынамі С., вучыла іх гасп. справам, размяркоўвала паміж імі працу, сачыла за парадкам у хаце, гатавала ежу, пякла хлеб і інш., нявесткі поўнасцю залежалі ад свякрухі; першай памочніцай гаспадыні была старэйшая нявестка. У 2-й пал. 20 ст. на Беларусі пераважала малая нуклеарная сям'я (у сярэднім 3,1 чал.).

Паводле перапісу насельніцтва 1990 у Беларусі 2,4 млн. сямейных пар, каля 400 тыс. няпоўных сем'яў. Сярэдні памер С. 3,1 чал. (3,2 чал. ў горадзе, 3 чал. на вёсцы).

Сац. вызначальнікамі структуры С. з'яўляюцца сац. аднароднасць ці неаднароднасць яе членаў, іх адукацыя, прафесія; этнічнымі — узаемаадносіны паміж мужам і жонкай адной ці розных нацыянальнасцей, паміж бацькамі і дзецьмі (нараджэнне дзяцей, этн. змешванне, нац. ці рэлігійнае самавызначэнне іх), паміж пакаленнямі (перадача культ. традыцый) і інш. Сучасная С. арыентавана на 1—2 дзяцей. Яе стан характарызуецца шэрагам процілеглых тэндэнцый: ператварэнне С. ў маральна-прававы саюз мужчыны і жанчыны і рост сямейных калізій (змяншэнне трываласці шлюбна-сямейных адносін, зніжэнне нараджальнасці, рост колькасці няпоўных С., пазашлюбнай нараджальнасці і інш.). Традыц. тып патрыярхальнай С. з жорсткім размеркаваннем сямейных роляў і абавязкаў паступова змяняецца раўнапраўнымі сямейнымі адносінамі паміж мужчынам і жанчынай, паміж дарослымі і дзецьмі, якія заснаваны на іх павазе і ўзаемаразуменні.

Літ.: Азаров Ю.П. Семейная педагогика. М., 1993; Горбатенкова Л.М. Отец и семья. Мн., 1993; Дружинин В.Н. Психология семьи. М., 1996; Антонов А.И. Микросоциология семьи. М., 1998.

Г.М.Курыловіч Т.І.Кухаронак.

СЯМ'Я́ ў ж ы в ё л, устойлівае аб'яднанне асобін, засн. на палавой цязе, сувязях паміж бацькамі і патомкамі, тэр. супольнасці і неабходнасці сумеснага клопату пра патомства. Гэтыя ўмовы выконваюцца ў манагамнай С., напр., у аселых відаў птушак, пары якіх захоўваюцца да смерці аднаго з партнёраў, а ч. маладняку застаецца на тэр. бацькоў. Такія камунальныя ячэйкі характэрны і для некат. млекакормячых (напр., мангусты). У многіх птушак (асабліва ва ўмераных паясах) манагамная С. ўтвараецца толькі на сезон размнажэння, але часта пары аднаўляюцца і на новы перыяд. У гусей і лебедзяў адзінства С. падтрымліваецца таксама ў час сезонных міграцый і на зімоўках. У большасці млекакормячых жывёл утвараецца сямейная група, якая складаецца з самкі, яе патомства аднаго ці двух пакаленняў і без самца. Структура і ўстойлівасць сямейных ячэек у палігамных відаў абумоўлены асаблівасцямі тыпу палавых зносін — *праміскуітэт, полігінія* ці поліандрыя.

СЯМ'Я́ МОЎ, групоўка моў, якія ўтварыліся ў выніку бесперапыннай, але неаднолькавай на розных тэрыторыях эвалюцыі адной агульнай *прамовы*. С.м. лічаць індаеўрапейскія, іберыйска-каўказскія, фіна-угорскія, цюркскія, семіцкія групоўкі моў (пра кожную гл. асобны арт.). Мовы, што ўваходзяць у адну С.м., лічацца роднаснымі (гл. *Роднасць моў*). Па ўнутр. іерархічнай структуры С.м. можа быць адна- ці шматступенчатай у залежнасці ад таго, ці існавалі на шляху эвалюцыі больш прыватныя, прамежкавыя прамовы. Напр., раманскія мовы адносяцца да першага тыпу, бо бяруць пачатак ад нар. латыні; славянскія — да другога, паколькі паміж правасл. і сучаснымі слав. мовамі існавалі прамовы зах.-слав., усх.-слав., паўд.-славянская. Групоўка моў можа быць аднесена да С.м., калі паміж адзінкамі іх сістэм (фанем, марфем і інш.) назіраюцца рэгулярныя суадпаведнасці. Пошукамі такіх суадпаведнасцей займаецца *параўнальна-гістарычнае мовазнаўства*. Гл. таксама *Класіфікацыя моў, Мовы свету*.

Літ.: Сравнительно-историческое изучение языков разных семей. М., 1981.

А.Я.Міхневіч.

СЯМЯ́НКА, аднанасенны плод пакрытанасенных раслін, утвораны двума або некалькімі *пладалісцікамі*, з тонкім скурыстым *каляплоднікам*, што лёгка аддзяляецца ад насення. Тыповая С. — плод складанакветных, напр., сланечніка. Часам на С. ўтвараюцца крылападобныя выросты, чубкі, кручочкі і інш., якія спрыяюць іх распаўсюджванню.

СЯНА́Ж, грубы корм з правяленых траў, кансерваваных у герметычных умовах. Выкарыстоўваюць травы натуральных сенажацяў і пасяўныя. Для паскарэння падвяльвання (да 50—55% вільготнасці) травы здрабняюць (бабовыя дадаткова плюшчаць) і шчыльна закладваюць у *сянажныя сховішчы*. Корм кансервуецца ва ўмовах фізіял. сухасці асяроддзя, што выключае актыўнае развіццё бактэрый, і герметычнасці, што перашкаджае развіццю плесні. Спажыўная каштоўнасць С. (у 100 кг С. з канюшыны 30—35 кармавых адзінак і 4—5 кг засваяльнага пратэіну) абумоўлена высокім утрыманнем сухога рэчыва і захаваннем найб. каштоўных ч. раслін (лісця, суквецця).

СЯНА́ЖНАЕ СХО́ВІШЧА, збудаванне для нарыхтоўкі і захоўвання *сенажу*. Корм з адна- і шматгадовых траў, правялены і здробнены, захоўваюць у вежавых (вертыкальных) і траншэйных (гарызантальных) сховішчах.

С.с. верт. тыпу (с я н а ж н а я в е ж а) бывае з верхняй выгрузкай корму (робіцца з металу, зборнага жалезабетону, цэглы) і з ніжняй выгрузкай (метал. зварныя, драўляныя з поліэтыленавым чахлом). Вежы будуюць на тэр. ферм пераважна зборнымі з метал. лістоў або бетонных блокаў, зманціраваных на мана-



Да арт. **Сянажнае сховішча**. Схема сянажнай вежы: 1 — транспарцёр для выгрузкі сенажу; 2 — выгрузная шахта; 3 — разгрузчык; 4 — размеркавальнае прыстасаванне; 5 — трубапровад; 6 — пнеўматычны транспарцёр.

літым фундаменце. Іх аснашчаюць тэхн. сродкамі для загрузкі, размеркавання, ушчыльнення і выгрузкі кармоў. Гарыз. С.с. — заглыбленыя, паўзаглыбленыя і наземныя бетанаваныя

траншэі. Бываюць адна- і шматсекцыйныя, праязныя і непраязныя, з паветранепранікальнымі сценамі і стыкамі. На фермах найчасцей выкарыстоўваюць наземныя траншэі.

Літ.: Батищев В.Д. Механизация приготовления силоса и сенажа. М., 1983.

В.М.Кандрацьеў.

СЯНГА́Н, Ганконг, асобны адм. раён на ПдУ Кітая, на ўзбярэжжы Паўд.-Кітайскага мора. Пл. 1066 км². Нас. 7,12 млн. чал. (2000), больш за 98% — кітайцы. Адм. ц. — г. *Сянган* (Вікторыя). Міжнар. цэнтр знешнегандл. (у т.л. рээкспарт) і валютна-фін. аперацый (больш за 140 банкаў). Буйны прамысл. цэнтр (больш за 43 тыс. прадпрыемстваў); каля 80% прадукцыі ідзе на экспарт. Прам-сць: швейная, абутковая, эл.-тэхн., электронная, тэкст., харч., тытунёвая, нафтахім., суднабудаўнічая, цэм., фарфора-керамічная і інш. Вытв-сць пластмасавых вырабаў, гал. чынам цацак. Вытв-сць электраэнергіі 27 млрд. кВт·гадз (1996). Інтэнсіўнае агародніцтва, кветкаводства, свіна- і птушкагадоўля. Рыбалоўства. Кампаніі С. кантралююць гандл. флот агульным танажом 60 млн. т дэдвейт. Экспарт і рээкспарт прамысл. прадукцыі, ювелірных вырабаў, цацак. Турызм (штогод больш за 3 млн. чал.).

Тэр. С. ўваходзіла ў склад Кіт. дзяржавы з 3 ст. да н.э., але пасяленні тут з'явіліся толькі ў 11 ст. У час *англа-кітайскай вайны 1840—42* англічане захапілі в-аў Сянган. *Нанкінскім дагаворам 1842* ён замацаваны за Вялікабрытаніяй у «вечнае валоданне». У выніку *англа-франка-кітайскай вайны 1856—60* англічане захапілі паўд. ч. п-ва Каўлун. У 1898 Вялікабрытанія ўзяла ў арэнду на 99 гадоў яшчэ адну ч. п-ва Каўлун з прылеглымі астравамі, т.зв. «Новую тэрыторыю». Да пач. 20 ст. С. стаў адным з найбуйн. гандл. цэнтраў і партоў на Д. Усходзе. У 2-ю сусв. вайну акупіраваны яп. войскамі (1941—45). Пасля вайны адбыўся хуткі эканам. рост, які паставіў С. у адзін шэраг з новымі індустр. краінамі Усх. і Паўд.-Усх. Азіі. У 1984 падпісаны дагавор паміж урадамі КНР і Вялікабрытаніі аб вяртанні С. ў склад Кітая ў 1997. Пры гэтым урад КНР гарантаваў захаванне ў С. капіталіст. ладу паводле канцэпцыі «адна краіна — дзве сістэмы». З 1.7.1997 С. перайшоў пад юрысдыкцыю КНР як спец. адм. раён з уласным аўт. урадам.

СЯНГА́Н, Віктарыя, горад на ПдУ Кітая, адм. цэнтр аднайм. асобнага адм. раёна. Знаходзіцца часткова на в-ве Сянган, аддзеленым ад мацерыка вузкім пралівам (чыг. паром і трансп. тунэль), на мацерыку былы г. Цзюлун, які аб'яднаны з С. адміністрацыйна. Больш за 2 млн. ж. (2001). Буйны порт (штогадовы грузаабарот больш за 40 млн. т). Міжнар. аэрапорт. Гандл.-прамысл. і валютна-фін. цэнтр. Прам-сць: швейная, тэкст., абутковая, электронная, харч., суднабудаўнічая. Метрапалітэн. Ун-т. Турызм.

СЯНІЦКІ (Siennicki) Людвік (2.2.1677 — 24.1.1757), падарожнік і мемуарыст, даследчык Сібіры. З бел. шляхецкага роду герба «Бонча». Вучыўся ў Віленскай евангелісцкай школе. У пач. 18 ст. адміністратар Магілёўскай эканоміі, віцэ-губернатар Быхава, падстолі ВКЛ. У *Паўночную вайну 1700—21* палкоўнік, камандзір Бел. дывізіі. У 1707 разам са стрыечным братам ген. К.Сяніцкім здрадзіў каралю Аўгусту II — саюзніку Расіі і перайшоў на бок прашвед. групоўкі кн. Сапегаў. Адзін з кіраўнікоў *Быхава абароны 1707*; узяты ў рас. палон і ў 1709 сасланы ў Сібір (Табольск, потым Якуцк), адкуль вярнуўся на радзіму ў 1722. У сваіх мемуарах «Дакумент асаблівай міласэрнасці божай...» (Вільня, 1754) даў заснаваныя на ўласных назіраннях каштоўныя этнагр. апісанні якутаў і інш. сібірскіх народаў — хантаў, чукчаў, эвенкаў, юкагіраў, звесткі пра Японію (са слоў яп. палонных, што пацярпелі караблекрушэнне ў Ахоцкім м.).

Літ.: Кучинский А. Описание Сибири XVIII в.: (Материалы Л.Сеницкого о сибирских аборигенах и их культуре) // Сов. этнография. 1972. № 1; Могилевская хроника Т.Р.Сурты и Ю.Трубницкого // Полн. собр. рус. летописей. М., 1980. Т. 35.

В.А.Ярмоленка.

СЯНКЕ́ВІЧ Аляксандр Антонавіч (20.1.1884, в. Мікалаеўшчына Стаўбцоўскага р-на Мінскай вобл. — 29.6.1938), дзяржаўны і партыйны дзеяч Беларусі, вучоны, пісьменнік, публіцыст. Скончыў Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю (1902), мед. ф-т Мэрылендскага ун-та ў ЗША (Балтымар, 1913). Настаўнічаў у сельскіх школах. Удзельнік агр. рэв. руху ў 1905—06 на Беларусі. Адзін з арганізатараў нелегальнага настаўніцкага з'езда 9.7.1906 у Мікалаеўшчыне, які быў разагнаны паліцыяй. У канцы 1906 эмігрыраваў у ЗША. З 1908 чл. рус. аддзела амерыканскай сацыяліст. партыі, супрацоўнічаў у рус. рэв. прэсе. Займаўся мед. практыкай. У 1917 праз Японію трапіў на Д.Усход. Быў на сав. і прафс. рабоце, удзельнічаў у партыз. руху, працаваў нам. міністра нар. асветы Далёкаўсх. Рэспублікі. З 1920 камісар земляробства ў Хабараўску. З 1921 нарком аховы здароўя БССР. З 1923 на парт. рабоце ў Мінску, Барысаве і Віцебску. У 1924—26 заг. бел. сектара Камуніст. ун-та нац. меншасцей Захаду ў Маскве. З 1926 дацэнт БДУ, з 1928 рэктар Камуніст. ун-та Беларусі імя Леніна, адначасова заг. аддзелаў друку, культуры і прапаганды ЦК КП(б)Б. У 1931—32 працаваў у Ін-це л-ры і мастацтва Бел. АН. З 1932 дырэктар Ін-та гігіены і санітарыі Наркамата аховы здароўя РСФСР, з 1933 заг. сектара Міжнар. ленінскай школы, з 1935 ва Усесаюзным радыёкамітэце. Чл. ЦК КП(б)Б у 1927—32, канд. у чл. Бюро з 1928, чл. Бюро ЦК КП(б)Б у 1930—31. Канд. у чл. ў 1922—24, чл. ЦВК БССР у 1921—22, 1927—31. У сваіх працах аддаў данину вульгарнаму сацыялагізму. 10.1.1938 неабгрунтавана арыштаваны, у чэрв. прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны. Рэабілітаваны ў 1956. Прататып доктара Сташынскага ў рамане А.Фадзеева «Разгром», Алеся Садовіча ў рамане Я.Коласа «На растанях» і Баса-Грэнкі ў п'есе Я.Коласа «Забастоўшчыкі».

Літ.: Соломевич И.В. Родился на Немане... // Белорусский экватор. Мн., 1981.

І.У.Саламевіч.

СЯНКЕ́ВІЧ Васіль Іванавіч (н. 19.3.1959, в. Асіпавічы Драгічынскага р-на Брэсцкай вобл.), бел. мовазнавец. Д-р філал. н. (1997), праф. (2000). Чл.-кар. Бел. акадэміі адукацыі (1998). Скончыў Брэсцкі пед. ін-т (1980), з 1980 працуе ў ім (з 1992 заг. кафедры). Даследуе праблемы прагмалінгвістыкі, семантыкі бел., рус. і польскай моў. Аўтар кн. «Семантыка і прагматыка беларускай мовы» (1995), сааўтар «Тлумачальнага слоўніка тэрмінаў пачатковага навучання» (2001) і інш.

СЯНКЕ́ВІЧ (Сянькевіч) Віктар (псеўд. Язэп Барэйка; н. 19.1.1926, в. Гірстуны Глыбоцкага р-на Віцебскай вобл.), бел. гісторык, журналіст на эміграцыі. Скончыў Мадрыдскі ун-т (1958). Абараніў доктарскую дысертацыю на тэму «Пачаткі княства Літоўскага». У 2-ю сусв. вайну ў франц. антыфаш. Супраціўленні, у складзе 2-га Польскага корпуса ген. Андэрса ўдзельнічаў у вызваленні ад гітлераўцаў г. Балоння (Італія). Адзін з заснавальнікаў *Згуртавання беларусаў Вялікабрытаніі* (ліст. 1946). Друкаваўся ў бел. эмігранцкіх выданнях — час. «На шляху» (яго заснавальнік), «Зважай», газ. «Бацькаўшчына», «Беларус» і інш. Аўтар публікацый на гіст. тэмы, у т.л. «Пра ўдзел беларусаў на за-



Прыбярэжны раён **Сянгана**.

ходніх франтах другой сусветнай вайны», «Сымон Рак-Міхайлоўскі: З нагоды сотых угодкаў ад нараджэння», «Да 175-годдзя аднаўлення Вялікага княства Літоўскага», «Ю.І.Крашэўскі», «Матэрыялы з гісторыі ўзброеных сіл БНР», «У 70-я ўгодкі савецка-літоўскага мірнага дагавора», «Ігнат Грынявіцкі: да 135-годдзя ад нараджэння і 110 — ад смерці» і інш. З 1992 жыве ў ЗША.

У.І.Скрабатун.



А.А.**Сянкевіч**.



Г.**Сянкевіч**.

СЯНКЕ́ВІЧ (Sienkiewicz) Генрык (5.5.1846, в. Воля-Акшэйска Мазавецкага ваяв., Польшча — 15.11.1916), польскі пісьменнік, публіцыст. Вучыўся ў Варшаўскім ун-це (1869—71). У 1872—87 працаваў у перыяд. друку. На яго светапогляд і творчасць паўплываў «варшаўскі пазітывізм», які прапагандаваў ідэю супрацоўніцтва ў імя эканам. ўзвышэння Польшчы. Дэбютаваў аповесцю «Дарэмна» (1872). Тэмы ранніх аповесцей, апавяданняў і навел, у т.л. «Эскізы вугалем» (1877), «Цераз стэпы» (1879), «Па хлеб» (1880), «Бартак-пераможца» (1882) — жыццё польскага сялянства, лёс дзяцей, трагедыі польскіх эмігрантаў; іх вызначае патрыят. пафас у спалучэнні з трагічным светабачаннем. Шырокую вядомасць прынесла С. гіст. трылогія «Агнём і мячом» (1883—84), «Патоп» (1884—86), «Пан Валадыёўскі» (1887—88), прысвечаная гіст.-сац. асэнсаванню мінуўшчыны Польшчы 17 ст. У сац.-псіхал. раманах «Без догмату» (1889—90), «Сям'я Паланецкіх» (1893—94) праблемы жыцця Польшчы, духоўныя пошукі пакалення канца 19 — пач. 20 ст. Рэв. падзеі 1905—07 у Расіі ў рамане «Віры» (1909—10). Раман «Quo vadis» («Кама градзешы», 1895—96) — гісторыя супрацьстаяння хрысціянства і язычніцтва. Лепшы гіст. раман — «Крыжакі» (1897—1900) — эпапея барацьбы славян супраць Тэўтонскага ордэна на мяжы 14—15 ст.; ён вылучаецца псіхалагізмам, веданнем гіст. рэалій, маст. вобразнасцю. Аўтар прыгодніцкай аповесці «У пустыні і пушчы» (1910—11), незавершанага рамана пра напалеонаўскія войны «Легіёны» (1913—14, выд. 1918), літ.-крытычных прац «Пра гістарычны раман» (1889), «Леў Талстой» (1908) і інш. Творы С. неаднаразова экранізаваны. На бел. мову яго асобныя творы перакладалі П.Бітэль, М.Кенька, М.Машара, П.Татарыновіч, М.Фальскі. Нобелеўская прэмія 1905.

Тв.: Dzieła. T. 1—60. Warszawa, 1948—55; Бел. пер. — Янка-музыкант. Мн., 1938; Апавяданні. Мн., 1955; Здарэнне ў гарах // Далягляды, 87. Мн., 1987; Крыжакі. Мн., 1997; Рус. пер. — Собр. соч. Т. 1—9. М., 1983—85; Крестоносцы. Мн., 1983.

Літ.: Горский И.К. Исторический роман Сенкевича. М., 1966; Лявонава Е.А. Магія таленту: гісторыя і сучаснасць у творчасці Г.Сянкевіча // Лявонава Е.А. Плыні і постаці. Мн., 1998; Krzyżanowski J. Twórczość Henryka Sienkiewicza. Warszawa, 1970; Bujnicki T. Sienkiewicz i historia. Warszawa, 1981; Mazan B. «Impresjonizm» «Trylogii» Henryka Sienkiewicza. Łódź, 1993.

М.М.Хмяльніцкі.

СЯНКЕ́ВІЧ Юрый Аляксандравіч (н. 4.3.1937, г. Чайбалсан, Манголія), расійскі падарожнік, урач і тэлежурналіст. Палкоўнік мед. службы (1979), канд. мед. н. (1974). Нашчадак беларусаў — ураджэнцаў б. Віленскай губ. Скончыў Ленінградскую ваен.-мед. акадэмію (1960). Узначальваў Цэнтр мед.-біял. падрыхтоўкі касманаўтаў; значны яго ўклад у тэорыю авіякасм. медыцыны. З 1973 вядучы праграмы «Клуб падарожнікаў» на рас. тэлебачанні. Удзельнік экспедыцый у Антарктыку і Арктыку, плаванняў Т.*Хеердала* на папірусных лодках «Ра-1» (1969) і «Ра-2» (1970; гл. *«Ра»*) праз Атлантычны ак., трысняговай лодцы «Тыгрыс» па маршруце Эль-Курна (Ірак)— Джубуці (1977—78). Вывучае паводзіны чалавека ў экстрэмальных умовах. Дзярж. прэмія СССР 1987.

Тв.: На «Ра» через Атлантику. 2 изд. М., 1981; В океане «Тигрис». М., 1982; Их позвал горизонт. М., 1987 (разам з А.В.Шумілавым); Путешествие длиною в жизнь. М., 1999.

В.А.Ярмоленка.

СЯНКО́ЎСКІ Восіп (Юльян) Іванавіч (літ. псеўд. Барон Брамбеус; 31.3.1800, маёнтак Антокаль, каля Вільні — 16.3.1858), расійскі вучоны-ўсходазнавец, дыпламат, журналіст і пісьменнік, адзін з заснавальнікаў жанру навук.-фантаст. аповесці ў рас. л-ры. Чл.-кар. Пецярбургскай АН (1828). Скончыў Мінскую гімназію, Віленскі ун-т (1819) і ў складзе рас. місіі накіраваны ў Канстанцінопаль (Стамбул). Да 1821 падарожнічаў па Пярэдняй Азіі і Паўн.-Усх. Афрыцы. Авалодаў усімі мовамі араб. Усходу, асн. еўрапейскімі, кіт., тыбецкай, маньчжурскай і мангольскай. У 1822—47 праф. заснаванай ім кафедры ўсх. моў і арабістыкі Пецярбургскага ун-та (першы рас. прафесар-арабіст); адзін з заснавальнікаў рас. *ўсходазнаўства*. Заснавальнік і рэд. (1834—47, намінальна да 1856) час. «Библиотека для чтения», з 1840 рэд. час. «Сын Отечества». Супрацоўнічаў з час. «Северный архив», «Северная пчела» і інш. Падтрымліваў дзелавыя сувязі з М.І.*Грэчам*, Ф.В.*Булгарыным*, сяброўскія — з А.С.*Пушкіным* і А.*Міцкевічам*. Даследаваў гісторыю стараж. Усходу, у т.л. даісламскай Аравіі, вывучаў араб., перс., тур. філалогію; перакладаў на рус. мову і выдаваў творы класічнай араб. л-ры. Аўтар апісанняў сучасных яму краін Усходу, «усходніх», быт. навук.-філас. аповесцей.

Тв.: Собр. соч. Т. 1—9. СПб., 1858—59; Сочинения Барона Брамбеуса. М., 1989.

Літ.: Каверин В.А. Барон Брамбеус: История О.Сенковского... М., 1966; Ломоносов. Грибоедов. Сенковский. Герцен. Писемский: Биогр. повествования. Челябинск, 1997.

В.А.Ярмоленка.

СЯННА́, назва р. *Жыварэзка* ў верхнім цячэнні.

СЯННА́, рака ў Чэрыкаўскім р-не і на мяжы Краснапольскага р-на Магілёўскай вобл., левы прыток р. Сож (бас. р. Дняпро). Даўж. 59 км. Пл. вадазбору 543 км². Пачынаецца на ПдУ ад в. Кліны, вусце за 3 км на ПнЗ ад в. Ушакі. Цячэ пераважна ў межах Аршанска-Магілёўскай раўніны. Даліна трапецападобная, глыбокаўрэзаная, шыр. ад 300 м у вярхоўі да 1 км у ніжнім цячэнні. Пойма двухбаковая, месцамі адкрытая, лугавая. Рэчышча ад вытоку на працягу 15,8 км каналізаванае, у ніжнім і сярэднім цячэнні звілістае, месцамі моцназвілістае; шыр. 5—10 м, ніжэй пашыраецца да 17 м, у ніжнім цячэнні звужаецца да 5—6 м. Выкарыстоўваецца як водапрыёмнік меліярац. каналаў.

СЯННА́Я ЛІХАМА́НКА, паліноз, алергічнае захворванне, якое выклікаецца пылком раслін. Мае сезонны характар у залежнасці ад часу цвіцення раслін. С.л. гал. чынам выклікае пылок збожжавых, пустазелля (асабліва *амброзія*), некат. дрэў (бяроза, вольха, арэшнік). Праяўляецца *рынітам*, *ларынгітам* і інш. хваробамі органаў дыхання, слёзацячэннем і свербам у вачах, зрэдку прыступамі бранхіяльнай астмы. Магчыма спалучэнне С.л. з харч. алергіяй. Лячэнне тэрапеўтычнае.

СЯННА́Я МУКА́, парашкападобны *грубы корм*, які атрымліваюць шляхам размолу высакаякаснага *сена*. Лепшая сыравіна для С.м. — бабовыя травы, скошаныя ў фазе бутанізацыі ці ў пач. цвіцення, таксама бабова-злакавыя і бабова-злакава-разнатраўныя сумесі; вільготнасць сыравіны не перавышае 12%. У 100 кг С.м. з канюшыны ўтрымліваецца 70,2 кармавой адзінкі і 8,3 кг засваяльнага пратэіну; з віка-аўсянай сумесі адпаведна 65,7 і 9,7. Выкарыстоўваецца як дабаўка да рацыёну свіней, птушкі ў якасці крыніцы паўнацэннага пратэіну і вітамінаў (асабліва багатая каратынам, мае 100—150 мг у 1 кг).

СЯННО́, Сенненскае возера. На ўскраіне г. Сянно Віцебскай вобл., у бас. р. Крывінка. Пл. 3,15 км², даўж. 6 км, найб. шыр. 920 м, найб. глыб. 31,5 м, даўж. берагавой лініі 18,9 км, пл. вадазбору 67,9 км². Катлавіна лагчыннага тыпу, падзяляецца на глыбакаводны паўд. і мелкаводны паўн. плёсы. Схілы выш. да 21 м, у верхняй ч. пераважна разараныя, на З і Пн пад лесам і хмыз-

няком. Берагі выш. да 0,6 м, пясчаныя, месцамі зліваюцца са схіламі, абразіўныя. У паўн. плёсе востраў пл. 1,8 га. Дно да глыб. 2,5—3 м (месцамі да 6—7) пясчанае, глыбей выслана гліністым ілам. Зарастае слаба. Шыр. паласы надводнай расліннасці да 50 м, пашырана да глыб. 1,7 м, падводная расліннасць да глыб. 2,5 м. Упадаюць каля 20 ручаёў, у т.л. з Кулікоўскага воз., пратокай злучана з Багданаўскім возерам.

СЯННО́, горад, цэнтр Сенненскага р-на Віцебскай вобл., на беразе воз. Сянно. Вузел аўтадарог на Багушэўск, Чашнікі, Бешанковічы, Талачын. За 56 км на ПдЗ ад Віцебска. 8,9 тыс. ж. (2001).

У пісьмовых крыніцах упершыню ўпамінаецца ў 1534. У розны час належала Дз.Відуніцкаму-Любецкаму, Сапегам, Агінскім, Курчам, Серакоўскаму і інш. У 1595 згадваецца маёнтак, замак і мястэчка С. з «цэрквамі і іх фундушамі». З 1772 С. ў складзе Рас. імперыі, горад (1773), цэнтр *Сенненскага павета* (з 1773) Магілёўскай губерні (у 1773—77 і з 1802), намесніцтва (1778—96), Бел. губерні (1796—1802). У 1781 зацверджаны герб: у зялёным полі дзве скрыжаваныя залатыя касы (у знак багацця сенам). У 1897 у С. 4061 ж. (з іх 39,9% пісьменных). У пач. 20 ст. было 4367 ж., 543 дамы, 54 рамесныя прадпрыемствы (у 1907), натарыяльная кантора, 4 страхавыя агенты, паштовая кантора, тэлеграф, друкарня, фатаграфія, 10 заезных дамоў, 82 крамы, 6 корчмаў; адбывалася 6 кірмашоў у год; працавалі гар. вучылішча, 4-класная жаночая прагімназія, 3 б-кі, 2 бальніцы, аптэка. З 1919 С. ў складзе Віцебскай губ. РСФСР. З 1924 у складзе БССР, з 17.7.1924 цэнтр *Сенненскага раёна* Віцебскай акр., з 1938 — Віцебскай вобл. У 1939 у С. 4,3 тыс. ж., ільнозавод, заатэхнікум, бальніца, гасцініца, кінатэатр, лазня. У Вял. Айч. вайну з ліп. 1941 да 25.6.1944 С. акупіравана ням. фашыстамі, якія загубілі ў С. і раёне 3104 чал. Дзейнічала *Сенненскае патрыятычнае падполле*, у 1942—44 існавала Сенненска-Аршанская партыз. зона. 5,4 тыс. ж. у 1959, 5,2 тыс. ж. у 1970.

Працуюць: з-д сухога абястлушчанага малака, ільнозавод, 3 буд. арганізацыі, камбінат каап. прам-сці, дарожнае рамонтна-буд. ўпраўленне; 2 сярэднія школы, школа-інтэрнат, дзіцячая юнацка-спарт. школа, дзіцячая школа мастацтваў, *Сенненскі краязнаўчы музей*, 2 б-кі, бальніца, паліклініка, аптэка. Брацкія магілы сав. воінаў і партызан, магіла ахвяр фашызму. Каля С. гарадзішча жал. веку (мясц. назва Гарадок). *В.М.Удальцоў.*

СЯНЦЗЯ́Н, рака на ПнУ Кітая. Даўж. 801 км, пл. бас. 94,9 тыс. км^2. Вытокі на паўн. схілах гор Наньлін, цячэ пераважна па хвалістай раўніне, упадае ў воз. Дунтынху (бас. р. Янцзы). Летняе разводдзе, зімовая межань. Сярэдні расход вады каля вусця 2270 м^3/с. Выкарыстоўваецца для арашэння. На С. — гарады Хэн'ян, Сянтань (пач. суднаходства), Чанша.

СЯНЬКО́ Веньямін Іванавіч (н. 29.9.1946, г. Скідзель Гродзенскай вобл.), бел. вучоны ў галіне чыг. транспарту. Д-р тэхн. н. (1990), праф. (1992). Скончыў Бел. ін-т інжынераў чыг. транспарту (1969). З 1973 у Бел. ун-це транспарту (з 1989 дэкан ф-та, з 2001 рэктар). Навук. працы па прагназіраванні развіцця сістэм тэхн. абслугоўвання і рамонту рухомага саставу чыгункі, аптымізацыі інфраструктуры падсістэмы забеспячэння бяспечнай эксплуатацыі рухомага саставу, развіцці тэорыі і практыкі ацэнкі астаткавага рэсурсу трансп. тэхнікі.

Тв.: Экономико-математические методы и модели в планировании вагонного хозяйства. Гомель, 2001; Совершенствование организации технического обслуживания и текущего ремонта грузовых вагонов. Гомель, 2002.

СЯНЬКО́ Таццяна Уладзіміраўна (н. 29.1.1953, Мінск), бел. псіхолаг. Д-р псіхал. н. (1993), праф. (1995). Скончыла Мінскі пед. ін-т (1976). З 1976 у Мінскім пед. вучылішчы, з 1982 у Мінскім пед. ін-це, з 1990 у Рас. пед. ун-це, з 1993 заг. кафедры Ін-та павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў адукацыі Рэспублікі Беларусь, з 1994 у Бел. пед. ун-це. Навук. працы па праблемах сац. псіхалогіі, псіхалогіі ўзаемадзеяння, дыягностыкі і карэкцыі міжасобасных адносін.

Тв.: Успех и признание в группе: Ст. дошк. возраст. Мн., 1991; Психологическая служба в системе образования. Мн., 1998 (разам з Ю.М.Карандашавым); Психология взаимодействия. Ч. 1—4. Мн., 1999—2002.

СЯНЬКО́ Уладзімір Лявонавіч (н. 5.8.1946, в. Вішкавічы Чашніцкага р-на Віцебскай вобл.), дзяржаўны дзеяч Беларусі, дыпламат. Скончыў Маскоўскі ін-т міжнар. адносін (1973), Дыпламат. акадэмію МЗС СССР (1987). Працаваў у пасольстве СССР у Польшчы, цэнтр. апараце МЗС СССР. У 1991—92 нам. міністра, у 1994—97 міністр замежных спраў Рэспублікі Беларусь. З 1992 надзвычайны і паўнамоцны пасол Рэспублікі Беларусь у Польшчы, у 1994 — у Злучаным Каралеўстве Вялікабрытаніі і Паўн. Ірландыі, з 1997 — у Францыі, па сумяшчальніцтве ў Іспаніі і Партугаліі; пастаянны прадстаўнік Рэспублікі Беларусь пры ЮНЕСКА. Неаднаразова ўзначальваў дэлегацыю Рэспублікі Беларусь на сесіях Ген. Асамблеі ААН, інш. міжнар. форумах.

СЯНЬКО́ Ягор Ягоравіч (н. 8.1.1934, в. Міхалова Чашніцкага р-на Віцебскай вобл.), бел. фізік і педагог. Канд. фіз.-матэм. н. (1969), праф. (1990). Скончыў Віцебскі пед. ін-т (1958). З 1971 у Магілёўскім пед. ун-це (у 1972—92 дэкан ф-та, у 1976—88 заг. кафедры). Навук. працы па пытаннях радыеактыўнасці глебы і прыземнага слоя атмасферы, праблемах выкладання фізікі і радыяцыйнай бяспекі ў ВНУ.

Тв.: Суточные изменения эксхаляции *Rn* и концентрации его в атмосфере // Изв. АН СССР. Сер. Физика атмосферы и океана. 1968. Т. 4, № 5; Практические занятия по курсу общей физики. Мн., 1984 (разам з В.І.Вераксам, Г.А.Яфімчык).

СЯНЬКОЎ Ціт Рыгоравіч (2.4.1917, в. Старакожаўка Дрыбінскага р-на Магілёўскай вобл. — 22.2.1985), Герой Сав.



Возера **Сянно**.



Горад **Сянно**. Цэнтральная плошча.

Саюза (1944). Скончыў Краснадарскае ваен. авіявучылішча (1940), Вышэйшую афіцэрскую школу (1948), курсы ўдасканалення афіцэрскага саставу (1954), Ваенна-паветр. акадэмію (1958). У Чырв. Арміі з 1937. У Вял. Айч. вайну з 1941 на Зах., Сталінградскім, Варонежскім, Сцяпным, 1-м і 2-м Укр. франтах, удзельнік Сталінградскай, Курскай бітваў, Корсунь-Шаўчэнкаўскай, Львоўска-Сандамірскай, Яска-Кішынёўскай, Вісла-Одэрскай і Берлінскай аперацый. Штурман эскадрыллі капітан С. да чэрв. 1944 зрабіў 123 баявыя вылеты на бамбардзіроўку ўмацаванняў, чыг. вузлоў, скопішчаў жывой сілы і тэхнікі праціўніка. Да 1961 у Сав. Арміі.



Ц.Р.**Сянькоў**.

СЯНЬКО́ЎШЧЫНА, вёска ў Слонімскім р-не Гродзенскай вобл., на аўтадарозе Слонім—Масты. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 15 км на ПнЗ ад горада і чыг. ст. Слонім, 120 км ад Гродна. 532 ж., 232 двары (2002). Лясніцтва. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, амбулаторыя, аддз. сувязі. Царква. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан.

СЯНЯ́ВІНЫ, расійскі дваранскі род, з якога паходзіў шэраг ваенна-марскіх дзеячаў.

Навум Акімавіч (каля 1680 — 4.6.1738), віцэ-адмірал (1727). У Паўн. вайну 1700—21 як камандзір (з 1713) лінейнага карабля ў баі 4.6.1719 каля в-ва Эзель (цяпер Саарэмаа, Эстонія) прымусіў здацца 3 швед. караблі. У 1728—32 камандаваў галерным флотам. У рус.-тур. вайну 1735—39 камандуючы (з вер. 1737) *Дняпроўскай ваеннай флатыліяй*. Аляксей Навумавіч (1716 — 21.8.1797), адмірал (1775). Сын Навума Акімавіча. Удзельнік рус.-тур. вайны 1735—39 на караблях Дняпроўскай флатыліі. У Сямігадовую вайну 1756—63 камандаваў лінейным караблём пры блакадзе порта Кольберг (цяпер Калобжаг, Польшча). У рус.-тур. вайну 1768—74 камандаваў Данскай флатыліяй. Удзельнічаў у стварэнні рас. Чарнаморскага флоту. Дзмітрый Мікалаевіч (17.8.1768—17.4.1831), ген.-ад'ютант (1825), адмірал (1826). Стрыечны пляменнік Аляксея Навумавіча. Удзельнік рус.-тур. вайны 1787—91, Міжземнаморскага паходу Ф.Ушакова 1798—1800, Адрыятычнай экспедыцыі 1806—07, *Архіпелагскіх экспедыцый рускага флоту* (2-й экспедыцыі 1806—07), *руска-англійскай вайны на моры 1807—12*. З 1825 камандуючы Балт. флотам. Развіваў манеўраную тактыку ветразевага флоту. Яго імем наз. шэраг геагр. аб'ектаў, рас. і сав. баявых караблёў.

Літ.: Скрицкий Н.В. Самые знаменитые флотоводцы России. М., 2000.

СЯНЯЎСКІЯ, шляхецкі род герба «Ляліва» ў Рэчы Паспалітай. Вялі радавод ад Гунтара (? — каля 1494), які валодаў в. Сянява на р. Сан (адсюль прозвішча). Прадстаўнікі роду займалі значныя адм. і вайск. пасады ў Польшчы. З 17 ст. валодалі маёнткамі на Беларусі, тытулаваліся графамі «на Шклове і Мышы». Найб. вядомыя: Мікалай (1489 — 21.2.1569), ваявода рускі з 1553, гетман вял. каронны з 1563. Мікалай (каля 1520—84), сын Мікалая, кашталян камянецкі з 1576, гетман польны каронны з 1575. Пракоп (? — 9.1.1627), сын Адама Гераніма, харунжы каронны з 1622. Адам Геранім (1623/4—25/26.1.1650), сын Пракопа, староста львоўскі з 1648 і пісар польны каронны з 1649. Мікалай Геранім (1645 — 5.12.1683), сын Адама Гераніма, ваявода валынскі і гетман польны каронны з 1683. Адам Мікалай (1666 — 18.2.1726), сын Мікалая Гераніма, ваявода белзскі ў 1692—1710, гетман польны каронны з 1702, гетман вял. каронны з 1706, адначасова кашталян кракаўскі з 1710.

СЯРА́ГІ, вёска ў Слуцкім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 8 км на ПнЗ ад горада і чыг. ст. Слуцк, 110 км ад Мінска. 632 ж., 271 двор (2002). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Свята-Пакроўская царква. Брацкая магіла партызан і сав. воінаў. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

СЯРБУ́ЛАЎ Міхаіл Васілевіч, рускі скрыпач, педагог, кампазітар 2-й пал. 19 — пач. 20 ст. Скончыў Львоўскую кансерваторыю (1890, Францыя). У 1882—85 іграў у квартэце Кіеўскага аддзялення Рус. муз. т-ва. У 1890—94 вёў муз. дзейнасць у Мінску: выступаў з канцэртамі, на вечарах мясц. аматараў музыкі, выконваў сусв. творы скрыпічнай класікі. З сярэдзіны 1890-х г. працаваў у Пражскай кансерваторыі, Тбілісі, Кішынёве. Аўтар стр. трыо, квартэтаў, мініяцюр для скрыпкі і фп.

А.Л.Капілаў.

СЯ́РГАВА (Särgava) Карл Эрнст (17.4.1868, г.п. Вяндра Пярнускага пав., Эстонія — 12.4.1958), эстонскі пісьменнік. Нар. пісьменнік Эстоніі (1957). Скончыў Тартускую настаўніцкую семінарыю (1889). Друкаваўся з 1890. Цыкл апавяд. «Язвы» (т. 1—3, 1899—1901) пра жыццё вёскі, аповесць «Асветнік» (1904) пра вясковую інтэлігенцыю. Аўтар аповесцей «Ніколі» (1895), «Нясшчасны шчаслівец» (1899), драмы «Кветка папараці» (1920), камедыі «Новы міністр» (1922), гіст. рамана «Пойдзем у горад запісвацца, жыццё сваё палягчаць» (т. 1—2, апубл. 1968).

Тв.: Рус. пер. — Избр. произв. Таллин, 1956; Помогите! и другие рассказы. Таллин, 1963.

«СЯРГЕ́ЕВІЦКАЕ», торфапрадпрыемства ў р.п. Праўдзінскі Пухавіцкага р-на Мінскай вобл. Пабудавана ў 1966—68. Сыравіна з радовішча торфу Арэхаўскі Мох. Асн. прадукцыя (2002): торф фрэзерны, тарфяныя брыкеты.

СЯРГЕ́ЕВІЧЫ, вёска ў Дунілавіцкім с/с Пастаўскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса. За 36 км на ПдУ ад г. Паставы, 240 км ад Віцебска, 17 км ад чыг. ст. Варапаева. 227 ж., 100 двароў (2002). Базавая школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

СЯРГЕ́ЕВІЧЫ, вёска ў Пухавіцкім р-не Мінскай вобл., на паўд. беразе Сяргееўскага воз., на аўтадарозе Рудзенск—Шацк. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 28 км на З ад г. Мар'іна Горка, 56 км ад Мінска. 18 км ад чыг. ст. Рудзенск. 482 ж., 197 двароў (2002). Лясніцтва, Шацкая паляўнічая гаспадарка, база адпачынку «Фаварыт-гранд». Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Свята-Раства-Багародзіцкая царква. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан.

СЯРГЕ́ЕНКА Святлана Пятроўна (н. 15.4.1949, Мінск), бел. габаістка. Засл. арт. Беларусі (1985). Скончыла Бел. кансерваторыю (1973). У 1972—89 і з 2000 салістка Дзярж. акад. сімф. аркестра Беларусі, з 1991 — ансамбля «Класік-Авангард», з 1994 — малога сімф. аркестра «Мінск-аркестр», з 1996 — сімф. аркестра Бел. тэлебачання і радыё. Дыпламант міжнар. конкурсу «Пражская вясна» (1974), лаўрэат Усесаюзнага конкурсу выканаўцаў на драўляных духавых інструментах (1979, Мінск).

СЯРГЕ́ЕЎ Канстанцін Міхайлавіч (5.3.1910, С.-Пецярбург — 1.4.1992), расійскі артыст балета, балетмайстар, педагог. Нар. арт. СССР (1957). Герой Сац. Працы (1991). Скончыў Ленінградскае харэаграфічнае вучылішча (1930), у 1938—40 і з 1973 маст. кіраўнік у ім (з 1991 Акадэмія рус. балета імя А.Ваганавай, С. — прэзідэнт). У 1930—61 вядучы танцоўшчык, у 1951—55 і 1960—70 гал. балетмайстар Ленінградскага т-ра оперы і балета. Танцоўшчык лірыка-рамант. плана, выканаўца асн. класічнага рэпертуару т-ра. Сярод партый: Рамэо, Прынц («Рамэо і Джульета», «Папялушка» С.Пракоф'ева), Яўген («Медны коннік» Р.Гліэра), Вацлаў («Бахчысарайскі фантан» Б.Асаф'ева), Альберт («Жызэль» А.Адана), Зігфрыд («Лебядзінае возера» П.Чайкоўскага) і інш. Сярод пастановак: «Папялушка» Пракоф'ева (1946, 1964), «Сцежкаю грому» К.Караева (1958), «Гамлет» М.Чарвінскага (1970). Здзейсніў рэдакцыі класічных балетаў, у т.л. «Раймон-

да» (1948; Дзярж. прэмія СССР 1949). Зняўся ў кінафільмах-канцэртах, у т.л. «Майстры рускага балета» (1953). Аўтар сцэнарыяў тэлефільмаў-канцэртаў «Дыялог са сцэнай» (1988), «Нараджэнне танца» (1991). Творчасці С. прысвечаны тэлефільм «Канстанцін Сяргееў. Старонкі харэаграфіі» (1976). Дзярж. прэміі СССР 1946, 1947, 1951. Прэмія Парыжскай акадэміі танца (1965).

С.В.Гуткоўская.

СЯРГЕ́ЕЎ Яўген Мікалаевіч (23.3.1887, с. Талавая Балка Кіраваградскай вобл., Украіна — 10.9.1937), удзельнік грамадз. вайны на Беларусі, камдыў (1935). Скончыў Акадэмію Генштаба (1915). Удзельнік 1-й сусв. вайны, падпалкоўнік. З 1918 у Чырв. Арміі, з кастр. на Усх. фронце. З крас. 1920 на Зах. фронце: нач. упраўлення штаба фронту, камандуючы Паўн. групай войск 15-й арміі і камандуючы 4-й арміяй. Вызначыўся ў час прарыву польск. фронту на Беларусі летам 1920. З 1921 на штабных і камандных пасадах у РСЧА (у 1926—28 нач. штаба БВА).

П.А.Селіванаў.

СЯРГЕ́ЕЎ Яўген Міхайлавіч (н. 23.3.1914, Масква), расійскі геолаг. Акад. АН СССР (1979, чл.-кар. з 1966). Скончыў Маскоўскі ун-т (1940), дзе і працаваў. У 1981—86 рэктар Акадэміі нар. гаспадаркі. Навук. працы па інж. геалогіі, грунтазнаўстве і гідралогіі. Распрацаваў вучэнне аб фарміраванні фіз., фіз.-хім. і фіз.-мех. уласцівасцей горных парод у працэсе літагенезу, аб грунтах як многакампанентных дынамічных сістэмах. Стварыў агульную інж.-геал. класіфікацыю горных парод. Дзярж. прэміі СССР 1977, 1988. Ленінская прэмія 1982.



К.**Сяргееў** у ролі Прынца.

Тв.: Инженерная геология СССР. Т. 1—8. М., 1976—78 (у сааўт.).

СЯРГЕ́ЕЎСКАЕ ВО́ЗЕРА, Сяргеевіцкае возера, Муха. У Пухавіцкім р-не Мінскай вобл., у бас. р. Пціч, за 25 км на З ад г. Мар'іна Горка. Пл. 2,75 км^2, даўж. 2,2 км, найб. шыр. 1,6 км, найб. глыб. 7,5 м. Схілы катлавіны нізкія, забалочаныя, параслі хмызняком. Дно выслана сапрапелем. Сцёк праз канал у р. Пціч.

СЯРГЕ́ЕЎ-ЦЭ́НСКІ (сапр. Сяргееў) Сяргей Мікалаевіч (30.9.1875, с. Прабражэнскае Тамбоўскай вобл., Расія — 3.12.1958), рускі пісьменнік. Акад. АН СССР (1943). Скончыў Глухаўскі настаўніцкі ін-т (1895). Працаваў настаўнікам, быў на вайск. службе. Друкаваўся з 1898. Першы зб. вершаў — «Думы і летуценні» (1901). Аповесці «Сад» (1905), «Бабаеў» (1907), «Журба палёў» (1909), «Рух» (1910) і інш. пра розныя пласты рас. грамадства. У творах з канца 1920-х г. асэнсаванне новай рэчаіснасці («Жывая вада», 1927; «Шчасліўка», 1932; «Шукаць, заўсёды шукаць!», 1935). Вяршыня яго творчасці — эпапея «Ператварэнне Расіі» (12 раманаў, 3 аповесці, эцюды; апубл. 1914—59) пра рас. грамадства на пач. 20 ст. Услаўленне геразізму рус. народа ў эпапеі «Гарачая пара ў Севастопалі» (1937—39, Дзярж. прэмія СССР 1941), зб. апавяд. «Сапраўдныя людзі» (1943). Аўтар зб. вершаў «Родная зямля...» (1958), зб-каў публіцыст. артыкулаў і ўспамінаў «Пра высокае майстэрства» (1956), «Слова да маладых» (апубл. 1965), «Радасць творчасці» (апубл. 1969), п'ес і інш. На бел. мову апавяданне «Аракуш» пераклаў В.Рабкевіч.

Тв.: Собр. соч. Т. 1—12. М., 1967.

Літ.: Плукш П.И. С.Н.Сергеев-Ценский — писатель, человек. М., 1975.

А.Р.Жакаў.

СЯРГЕ́ЙЧЫК Святлана Аляксандраўна (н. 18.6.1949, г.п. Тураў Жыткавіцкага р-на Гомельскай вобл.), бел. вучоны ў галіне фізіялогіі раслін. Д-р біял. н. (1988). Скончыла БДУ (1971). З 1974 у Цэнтр. бат. садзе Нац. АН Беларусі (з 1992 гал. навук. супрацоўнік). Навук. працы па газаўстойлівасці раслін, прамысл. батаніцы, экалагічнай таксікалогіі, аптымізацыі навакольнага асяроддзя сродкамі азелянення гарадоў і прамысл. цэнтраў.

Тв.: Устойчивость древесных растений в техногенной среде. Мн., 1994; Растения и экология. Мн., 1997; Экологическая физиология хвойных пород Беларуси в техногенной среде. Мн., 1998 (разам з А.А.Сяргейчык, Я.А.Сідаровічам).

СЯРГЕ́ЙЧЫК Цімафей Мікалаевіч (20.6.1899, в. Заполле Глускага р-на Магілёўскай вобл. — 27.5.1977), бел. акцёр. Нар. арт. Беларусі (1944). Скончыў Бел. драм. студыю ў Маскве (1926). У 1926—75 акцёр Бел. т-ра імя Я.Коласа, адначасова маст. кіраўнік студый т-ра. Выканаўца драм., характарных, камед. роляў. Майстар сцэн. пераўвасаблення. Творчасці ўласцівы высокае мастацтва жыццёвай праўды, глыбокае пранікненне ў вобраз. Псіхалагічна дакладна раскрываў характары ў нац. рэпертуары: шкаляр Самахвальскі («Несцерка» В.Вольскага), дзед Мікіта, Саўка Мільгун («Вайна вайне», «У пушчах Палесся» Я.Коласа), Лявон Зяблік («Раскіданае гняздо» Я.Купалы), Мікалай Міхалковіч («Ірынка» К.Чорнага), Барута («Людзі і д'яблы» К.Крапівы), Бокуць («Пагібель воўка» Э.Самуйлёнка) і інш. Сярод інш. роляў: Восіп («Рэвізор» М.Гогаля), Васьмібратаў, Кучумаў («Лес», «Шалёныя грошы» А.Астроўскага), Дасцігаеў, Лука («Ягор Булычоў і іншыя», «На дне» М.Горкага), Кулыгін («Тры сястры» А.Чэхава), Мілер («Каварства і каханне» Ф.Шылера), Феліцыян («Мараль пані Дульскай» Г.Запольскай), Бярсенеў («Разлом» Б.Лаўранёва), Гарнастаеў («Любоў Яравая» К.Транёва), Васін («Рускія людзі» К.Сіманава), Таланаў («Нашэсце» Л.Лявонава) і інш. Паставіў спектаклі «Пінская шляхта» В.Дуніна-Марцінкевіча (1928), «Дзеці Ванюшына» С.Найдзёнава (1938), «Ірынка» (1941), «Блудны сын» Э.Ранета (1958).



Я.М.**Сяргееў**.



Ц.М.**Сяргейчык**.

Тв.: Нататкі акцёра. Мн., 1973.

Літ.: Есакоў А. Жыццё і творчасць // Майстры беларускай сцэны. Мн., 1960; Няфёд У.І. Беларускі тэатр імя Я.Коласа. Мн., 1976.

У.І.Няфёд.



Ц.**Сяргейчык** у ролі Лявона Зябліка.

СЯРДЗЮ́К Аляксандр Іванавіч (27.6.1900, с. Бзоў Барышаўскага р-на Кіеўскай вобл. — 1989), украінскі акцёр, рэжысёр. Нар. арт. СССР (1951). Скончыў Кіеўскі муз.-драм. ін-т (1919). З 1919 акцёр кіеўскага 1-га дзярж. т-ра Украіны, з 1922 — Харкаўскага драм. т-ра імя Т.Шаўчэнкі (у 1957—62 дырэктар і маст. кіраўнік). З 1946 выкладчык Харкаўскага ун-та мастацтваў (з 1960 праф.). Мастацтва С. вызначалася глыбінёй псіхал. трактоўкі, часам вострай публіцыстычнасцю. Сярод роляў: Гараднічы («Рэвізор» М.Гогаля), Ягор Булычоў («Ягор Булычоў і іншыя» М.Горкага), Платон, Кобза («Платон Крэчат», «Гібель эскадры» А.Карнейчука), Мікіта («Яраслаў Мудры» І.Качаргі), Сяргееў («Генерал Ватуцін» Л.Дзміцеркі), Каравай («Таблетку пад язык» А.Макаёнка) і інш. Паставіў спектаклі: «Ой, пайду я ў Барыслаўку» паводле І.Франко (1956), «Маруся Багуслаўка» М.Старыцкага (1962) і інш. Здымаўся ў кіно. Дзярж. прэміі СССР 1947, 1948.

СЯРДО́БАЎ Мікалай Мікалаевіч (16.12.1905, г. Самара, Расія — 24.11.1990), бел. спявак (лірыка-драм. барытон), педагог. Засл. арт. Арменіі (1939). Нар. арт. Беларусі (1955). Скончыў Куйбышаўскі муз. тэхнікум (1929). З 1930 у оперных т-рах Куйбышава, Ерэвана, Пермі, Свярдлоўска. З 1946 саліст Дзярж. т-ра оперы і балета Беларусі. У 1960—75 выкладчык і рэжысёр Опернай студыі Бел. кансерваторыі, адначасова ў 1960—87 кіраўнік Мінскай нар. опернай студыі Палаца культуры Белсаюзпрофа. Творчасці С. ўласцівы глыбокае асэнсаванне характараў герояў, свабоднае валоданне вак. і акцёрскімі сродкамі выразнасці, сцэнічная абаяльнасць. Сярод партый бел. рэпертуару: Каліноўскі («Кастусь Каліноўскі» Дз.Лукаса), Дзяніс Давыдаў («Надзея Дурава» А.Багатырова), фон Шолен («Дзяўчына з Палесся» Я.Цікоцкага); інш. партыі на бел. сцэне: Анегін, Чорт («Яўген Анегін», «Чаравічкі» П.Чайкоўскага), Алека («Алека» С.Рахманінава), Фігара («Севільскі цырульнік» Дж. Расіні), Рыгалета, Аманасра («Рыгалета», «Аіда» Дж.Вердзі), Скарпія («Тоска» Дж.Пучыні), Мацей («Страшны двор» С.Манюшкі). Паставіў оперы «Павел Карчагін» П.Падкавырава, «Кастусь Каліноўскі» Лукаса, «Яўген Анегін» і «Іаланта» Чайкоўскага, «Царская нявеста» М.Рымскага-Корсакава, «Алека» Рахманінава, «Рыгалета» і «Травіята» Вердзі, «Джані Скікі» і «Плашч» Пучыні, «Цар і цясляр» А.Лорцынга, «Даліна» Э.Д'Альбера, «Мадэмуазель Фіфі» і оперу-казку для дзяцей «Кот у ботах» Ц.Кюі.

Дз.М.Жураўлёў.

СЯРЖА́НІН Іван Мікалаевіч (14.10.1898, г. Любань Мінскай вобл. — 2.2.1973), бел. вучоны ў галіне заалогіі пазваночных жывёл. Чл.-кар. АН Беларусі (1959), д-р біял. н. (1957), праф. (1958). Засл. дз. нав. Беларусі (1968). Скончыў БДУ (1926). З 1938 у Ін-це біялогіі (заг. аддзела), з 1959 заг. Аддзела заалогіі і паразіталогіі АН Беларусі, адначасова ў 1947—70 праф., заг. кафедры БДУ. Навук. працы па фауністыцы, зоагеаграфіі і экалогіі, гасп. значэнні каштоўных відаў млекакормячых. Прааналізаваў гіст. змены і працэсы фарміравання тэрыяфауны, распрацаваў схему зоагеагр. раянавання Беларусі і мерапрыемствы па ахове і аднаўленні колькасці баброў.

Тв.: Млекопитающие Белоруссии. 2 изд. Мн., 1961; Определитель млекопитающих Белоруссии. Мн., 1967 (разам з Ю.І.Сяржаніным, В.В.Слесарэвічам).

Літ.: Кохненко С.В., Меркушева И.В. К 70-летию профессора И.Н.Сержанина // Зоолог. журн. 1969. Т. 48, вып. 4.

СЯРЖА́НТ (франц. sergent ад лац. serviens служачы), воінскае званне малодшага каманднага (унтэр-афіцэрскага) саставу ва ўзбр. сілах шэрагу дзяржаў, у т.л. ў Рэспубліцы Беларусь.



М.М.**Сярдобаў**.

І.М.**Сяржанін**.

І.Я.**Сяржантаў**.

Званне С. з'явілася ў 15 ст. ў франц., потым у герм. і англ. арміях. У Расіі званне (чын) С. уведзена ў 17 ст. ў палках «новага строю»; у рэгулярнай арміі Рас. імперыі існавала ў 1716—98; у Чырв. Арміі — з 1940.

Ва Узбр. Сілах Рэспублікі Беларусь званне С. уведзена ў 1992. Прысвойваецца курсантам, якія скончылі навучанне ў навуч. часці па праграме падрыхтоўкі С. з адзнакай «выдатна»; малодшым С., годным прысвоення чарговага воінскага звання і прызначаным на пасады, дзе штатамі прадугледжана званне С. (*старшы сяржант, старшына*), або пры звальненні іх у запас. У карабельнага складу Узбр. Сіл (Пагран. войскі і інш.) званню С. адпавядае званне старшына 1-й стацці.

В.А.Сергіенка.

СЯРЖА́НТ Рафаіл Іванавіч (28.1.1897, в. Гавязна Стаўбцоўскага р-на Мінскай вобл. — 4.4.1974), удзельнік рэв. і нац.-вызв. руху ў Зах. Беларусі. У рэв. руху з 1920, напачатку ў КСМЗБ, з 1925 у КПЗБ. 30.10.1925 арыштаваны, прыгавораны да пакарання смерцю, якое заменена 15 гадамі строгага турэмнага зняволення. Выйшаў на волю ў вер. 1939 у выніку вызвалення Зах. Беларусі Чырв. Арміяй. З 1939 на гасп. і сав. рабоце, нам. старшыні Баранавіцкага аблвыканкома. Удзельнік Вял. Айч. вайны. У 1945—61 на сав. рабоце ў Баранавічах. Дэп. Вярх. Савета СССР у 1940—46.





СЯРЖА́НТАЎ Іван Якаўлевіч (17.2.1919, в. Якаўлевічы Аршанскага р-на Віцебскай вобл. — 29.4.1943), Герой Сав. Саюза (1943). Скончыў Аршанскі аэраклуб (1938), Чугуеўскую ваен. авіяшколу лётчыкаў (1941). У Вял. Айч. вайну з 1942 на Паўд. фронце. Лётчык-знішчальнік лейтэнант С. да крас. 1943 зрабіў 258 баявых вылетаў, правёў 85 паветр. баёў, збіў асабіста 3, у групе 8 самалётаў праціўніка; памёр ад ран.

СЯРКО́Ў Іван Кірэевіч (4.1.1929, в. Пакалюбічы Гомельскага р-на — 27.5.1998), бел. пісьменнік. Скончыў БДУ (1962). Працаваў у Гомельскай раённай газеце, на Гомельскай студыі тэлебачання, з 1977 адначасова сакратар Гомельскага абл. аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі. Друкаваўся з 1957. У аповесцях «Мы з Санькам у тыле ворага» (1968),



М.**Сярдобаў** у ролі Каліноўскага (у цэнтры).

«Мы — хлопцы жывучыя» (1970), «Мы з Санькам у артылерыі» (1988) паказаў, як вясковыя падлеткі змагаліся супраць ням.-фаш. акупантаў. Аўтар сцэнарыя тэлефільма «Мы — хлопцы жывучыя» (паст. 1974).

СЯРКУ́ЦЦЕЎ Генадзь Васілевіч (н. 17.3.1937, г. Орша Віцебскай вобл.), бел. вучоны ў галіне педагогікі. Д-р пед. н. (1994), праф. (2000). Засл. работнік адукацыі Беларусі (1999). Скончыў Ленінградскі ін-т інжынераў чыг. транспарту (1964). У 1957—76 на інж.-тэхн. і пед. рабоце ў г. Валгаград. З 1979 у Бел. філіяле Усесаюзнага НДІ прафтэхадукацыі. З 1985 дырэктар СПТВ №103 г. Мінска, з 1991 — Мінскага вышэйшага прафес. вучылішча чыг. транспарту, з 2001 Мінскага прафес.-тэхн. каледжа чыг. транспарту. Навук. працы па праблемах дыдактыкі, педагогікі, методыкі і тэхналогіі прафес. навучання, арганізацыі выхаваўчага працэсу, вучнёўскага самакіравання.

Тв.: Организация учебно-воспитательного процесса в ПТУ: новые подходы. Мн., 1991; Научно-педагогические основы подготовки рабочих кадров. Мн., 1998; Технология преподавания «Всемирной истории» по методу «погружения». Мн., 1999 (разам з І.Г.Буко); Методика преподавания дисциплины «Устройство и эксплуатация пассажирских вагонов» по методу «погружения». М., 2001.

В.У.Чэчат.

СЯРМЯ́ГА, 1) грубае нефарбаванае даматканае сукно. 2) Верхняе адзенне з такога сукна. Вядома ўсх. славянам, палякам, літоўцам, мардве і інш. Упершыню ўпамінаецца ў летапісах пад 1395, у 15—16 ст. уваходзіла ў царскае летняе ездавое ўбранне. На Беларусі С. — верхняя мужчынская і жаночая вопратка белага ці шэрага колеру (на Пд Гродзеншчыны карычневага). Апраналі звычайна на кашулю, з поясам. Насілі ў халодную пару (на Віцебшчыне паверх насова і футра). Даўнія С. доўгія, двухшвовыя, прамоґа з суцэльнай спінкай крою, больш позніе — карацейшыя, прыталеныя, у зборкі, раскошанага крою. Адна- і двухбортныя, без каўняра ці з каўняром, зашпільваліся на гаплікі, гузікі. Святочную С. аздаблялі шнуркам, вышыўкай, аплікацыяй (каляровая тканіна, скура). Кроем спінкі, размяшчэннем дэкору (узоры накшталт зігзагаў, галінак дрэў, кветак) вылучаліся белыя С. з-пад Камянца; абшываліся паласой чорнага аксаміту.

Літ.: Левинсон-Нечаева М.Н. Приложение: Материалы к истории рус. нар. одежды // Крестьянская одежда населения Европейской России (XIX — начало XX в.): Определитель. М., 1971.

М.Ф.Раманюк.

СЯРМЯ́ЖКА Яўген Іванавіч (н. 2.5.1934, в. Пружанка Бярэзінскага р-на Мінскай вобл.), бел. вучоны ў галіне педагогікі. Канд. пед. н. (1967), праф. (1990). Скончыў Полацкі пед. ін-т (1957). У 1965—74, 1976—80 у Гродзенскім пед. ін-це. У 1974—76 саветнік-консультант Мін-ва адукацыі Рэспублікі Куба. З 1980 у Магілёўскім ун-це (у 1980—94 заг. кафедры). Навук. працы па бел. нар. педагогіцы, праблемах сямейнага выхавання і падрыхтоўкі пед. кадраў.

Тв.: Подумаем вместе. Мн., 1984; Настольная книга родителей: Хрестоматия по семейному воспитанию. Мн., 1987 (у сааўт.); Праблемы дзяцей у сям'і. Мн., 1993; Педагогика в вопросах и ответах. Могилев, 1999; Семейная педагогика в вопросах и ответах. Могилев, 2001.

СЯРНІ́СТАЯ КІСЛАТА́, водны раствор серы дыаксіду, H_2SO_3; гл. ў арт. *Серы аксіды*.

СЯРНІ́СТЫ ГАЗ, серы дыаксід SO_2; гл. ў арт. *Серы аксіды*.

СЯРО́ВА Зоя Якаўлеўна (н. 22.6.1929, Мінск), бел. вучоны ў галіне фітапатафізіялогіі. Д-р біял. н. (1987). Скончыла БДУ (1953). З 1956 у Ін-це эксперым. батанікі Нац. АН Беларусі (у 1960—69 вучоны сакратар аддзела, 1971—82 заг. лабараторыі). Навук. працы па праблемах фітаімунітэту, абгрунтаванні агульнабіял. канцэпцыі фітапатагенезу, распрацоўцы новай стратэгіі аховы раслін.

Тв.: Метаболизм нуклеиновых кислот у растений в связи с грибной инфекцией. Мн., 1986 (разам з Г.І.Спірыдонавай); Проблемы иммунитета сельскохозяйственных растений к болезням. Мн., 1988 (у сааўт); Функции белков в фитопатогенезе. Мн., 1992 (разам з Л.С.Юшко, Г.М.Падчуфаравай).



Сяродкрыжжа сабора ў г. Эчміядзін (Арменія). 5 ст. Рэканструкцыя.

СЯРО́ВА Ірына Іванаўна (26.10.1930, в. Бакрылава Усць-Кубінскага р-на Валагодскай вобл., Расія — 20.1.2001), бел. філосаф. Д-р філас. н. і праф. (1977). Засл. работнік вышэйшай школы Беларусі (1979). Скончыла Іванаўскі пед. ін-т (1952). З 1958 у Карачаеўскім пед. ін-це. З 1962 у Магілёўскім пед. ін-це (у 1974—89 заг. кафедры). Навук. працы па праблемах фарміравання і выхавання асобы, культуры міжнац. адносін, нац. палітыкі, гісторыі сац.-паліт. думкі Беларусі, методыкі выкладання грамадскіх навук.

Тв.: О пролетарском интернационализме. Мн., 1970; Сила, сплачивающая воедино: Интернац. воспитание трудящихся в развитом соц. о-ве. Мн., 1975; Советская общенациональная гордость. Мн., 1981; Культура межнационального общения. Мн., 1986; Лектор в студенческой аудитории: Пробл. общения. Мн., 1988.



Святочная **сярмяга**.

СЯРОДКРЫ́ЖЖА ў архітэктуры, частка культавага збудавання, утвораная перасячэннем аднаго або некалькіх падоўжных *нефаў* з папярочным *трансептам*. У Зах. Еўропе вядома з антычнасці, пашырана ў сярэдневякоўі ў раманскім і гатычным стылях. На Беларусі пашырана ў мураваных *крыжова-купальных храмах* 11—12 ст., мураваных і драўляных базілікальных збудаваннях, крыжова-цэнтрычных храмах 16 — пач. 20 ст. стыляў барока, класіцызму, псеўдарускага, несапраўднай готыкі і інш. Звычайна цэнтр С. вылучаўся купалам (Нясвіжскі касцёл езуітаў, Гомельскі Петрапаўлаўскі сабор, Ельская Троіцкая царква) або вежачкай-сігнатуркай (Гервяцкі Троіцкі касцёл, царква Параскевы Пятніцы ў в. Чарнаўчыцы Брэсцкага р-на і інш.).

СЯРО́Ў, да 1939 Надзеждзінск, горад у Свярдлоўскай вобл. Расіі. Размешчаны на ўсх. схіле Паўн. Урала, на р. Каква, за 9 км ад яе ўпадзення ў р. Сосьва (бас. р. Об). Засн. ў 1894. 100,4 тыс. ж. (1996). Вузел чыгунак. Прам-сць: чорная металургія (металургічны камбінат, з-д ферасплаваў), машынабудаванне (з-ды: мех., рамонтна-мех.), буд. матэрыялаў (з-д жалезабетонных вырабаў),

дрэваапр., лясная, харчовая. Птушкафабрыка. ГРЭС. Ф-т Уральскага дзярж. ун-та. Драм. тэатр. Гіст. музей. Названы ў гонар Героя Сав. Саюза А.К.Сярова.

СЯРО́Ў Аляксандр Мікалаевіч (23.1.1820, С.-Пецярбург — 1.2.1871), рускі кампазітар; адзін з заснавальнікаў рус. муз. крытыкі. Скончыў вучылішча правазнаўства (1840). У 1840—68 служыў ва ўстановах мін-ваў юстыцыі і ўнутр. спраў. Самастойна авалодаў кампазітарскай тэхнікай. З 1850-х г. удзельнік муз. вечароў у М.Глінкі. Выступаў за асваенне новых жанраў, у т.л. гіст.-легендарнай і нар.-быт. оперы. Сярод твораў: оперы «Юдзіф» (паст. 1863), «Рагнеда» (паст. 1865), «Варожая сіла» (паст. 1871; завершана жонкай В.Сяровай і М.Салаўёвым); 2 кантаты для салістаў, хору і арк., творы для арк., камерна-інстр. ансамблі, санаты і інш. п'есы для фп., хары, рамансы, апрацоўкі нар. песень; музыка да спектакляў драм. т-ра і інш. Пісаў пра творчасць Глінкі, А.Даргамыжскага, Р.Вагнера, Л.Бетховена і інш.

Тв.: Статьи о музыке. Вып. 1—6. М., 1985—90.

Літ.: Черкашина М. А.Н.Серов. 2 изд. М., 1988.

СЯРО́Ў Валянцін Аляксандравіч (19.1.1865, С.-Пецярбург — 5.12.1911), рускі жывапісец. Сын А.М.*Сярова*. Правадз. чл. Пецярб. АМ (1903—05). Вучыўся ў І.*Рэпіна*, у Пецярбургскай АМ (1880—85). У 1897—1909 выкладаў у Маскоўскім вучылішчы жывапісу, скульптуры і дойлідства. Чл. Т-ваў перасоўных маст. выставак (гл. *Перасоўнікі*), *«Свет мастацтва»*. Раннім творам уласцівы непасрэднасць успрыняцця натуры, распрацоўка светлавых і колеравых эфектаў, святлопаветранага асяроддзя; «Дзяўчынка з персікамі» (1887), «Дзяўчына, асветленая сонцам» (1888). З 1890-х г. асн. жанрам стаў партрэт, які вылучаецца псіхал. завостранымі характарыстыкамі, падкрэсленай артыстычнасцю: А.Мазіні (1890), Ф.Таманьё (1891—93), К.Каровіна (1891), І.Левітана (1893), М.Рымскага-Корсакава (1898). Адмовіўшыся ад папярэдняга шматфарбавага, сакавітага колеру жывапісу, аддаваў перавагу адной дамінуючай гаме чорна-шэрых або карычневых тонаў, карыстаўся больш свабодным, шырокім мазком. З канца 1890-х г. пісаў парадныя партрэты (вял. князя Паўла Аляксандравіча, 1897; Ф.Ф.Юсупава, 1903), камерныя партрэты дзяцей і жанчын («Дзеці», 1899; «Міка Морозаў», 1901), пейзажна-жанравыя кампазіцыі на сял. тэмы («Кастрычнік. Даматканава», 1895; «Баба на калёсах» 1899), якія вызначаюцца вытанчаным малюнкам, лаканізмам выяўл. сродкаў, глыбінёй сац. характарыстык. Рысы мадэрна праявіліся ў партрэтах М.Горкага (1904), М.Ярмолавай, Ф.Шаляпіна (абодва 1905), І.А.Марозава (1910) і інш. У позняй творчасці значнае месца займаў гіст. жывапіс, якому ўласцівы глыбіня спасціжэння эпохі («Пётр I», 1907), багацце адценняў у характарыстыцы герояў і абставін («Выезд Пятра II і цэсарэўны Лізаветы Пятроўны на паляванне», 1900). Пісаў карціны на міфал. сюжэты («Адысей і Наўзікая», 1909—10; «Выкраданне Еўропы», 1910). Афарміў спектакль «Юдзіф» А.Сярова (1907, Марыінскі т-р у Пецярбургу). Ілюстраваў творы А.Пушкіна, М.Някрасава, М.Лермантава, І.Крылова.

Літ: Грабарь И.Э. В.А.Серов. 2 изд. М., 1980; В.А.Серов: Живопись. Графика: Кат. М., 1981; Сарабьянов Д.В. В.А.Серов: [Альбом]. Л., 1982. *Л.Ф.Салавей.*



В.**Сяроў**. Партрэт І.А.Марозава. 1910.

СЯРО́Ў Уладзімір Аляксандравіч (21.7.1910, с. Эмаус Цвярской вобл., Расія — 19.1.1968), расійскі жывапісец і графік. Нар. маст. СССР (1958). Правадз. чл. АМ СССР (1954). Прэзідэнт АМ СССР (1962—68). Вучыўся ў Ленінградскай АМ (1927—31), у І.І.*Бродскага* (1931—33). У 1933—42 выкладаў у Ленінградскай АМ. Працаваў пераважна ў гіст.-рэв. жанры, ствараў работы, якія вызначаліся ідэйнасцю, псіхал. абмалёўкай: «У.І.Ленін абвяшчае савецкую ўладу» (1947; Дзярж. прэмія СССР 1948), «Хадакі ў Леніна» (1950; Дзярж. прэмія СССР 1951), «Зімні ўзяты» (1954), «Дэкрэт аб міры», «Дэкрэт аб зямлі» (абедзве 1957). Аўтар партрэтаў удзельнікаў баёў пад Ленінградам, 1942—44, пейзажаў, плакатаў, кніжных ілюстрацый (да рамана Л.Талстога «Вайна і мір», 1951—53).



У.**Сяроў**. Зімні ўзяты. 1954.

Літ.: Лебедев А.К. В.А.Серов. М., 1965. *Л.Ф.Салавей.*

СЯРПО́К (Falcaria), род кветкавых раслін сям. парасонавых. Каля 5 відаў. Пашыраны ва ўмераным поясе Еўразіі і ў Паўн. Афрыцы. На Беларусі 1 від — С. звычайны (F. vulgaris). Трапляецца ў хмызняках, на ўзлесках, каля дарог, у пасевах.

Адна-, двух- і шматгадовыя травяністыя расліны. Сцёблы прамастойныя, галінастыя. Лісце трайчастае, скурыстае, востраплаватае па краі. Белыя кветкі сабраны ў складаны парасонік. Плод — віслаплоднік. Маладое лісце ўжываецца ў ежу, насенне — як прыправа. Харч., лек., кармавыя расліны, некат. пустазелле. *А.М.Скуратовіч*

СЯРПУ́ХА (Serratula), род кветкавых раслін сям. складанакветных. Каля 70 відаў. Пашыраны ў Еўразіі і Паўн. Амерыцы. На Беларусі 1 від — С. фарбавальная, ці некалючая (S. tinctoria). У культуры С.Вольфа (S. wolffii), зюзнікалістая (S. lycopifolia) і прамянёвая (S. radiata).

Шматгадовыя травяністыя расліны. Сцёблы прамастойныя, часам разгалінаваныя, апушаныя або голыя. Лісце чаргаванае, простае, суцэльнае ці перыстарассечанае, ніжняе чаранковае, на сцёблах — сядзячае. Кветкі ў кошыках белыя, ружовыя, пурпурныя. Кошыкі сабраны ў шчыткападобныя верхавінка-

выя суквецці або адзіночныя. Плод — сямянка. Фарбавальныя (для шэрсці), лек., меданосныя і дэкар. расліны. *А.М.Скуратовіч.*

СЯРЫ́Х Валянціна Васілеўна (н. 22.6.1954, г. Бабруйск Магілёўскай вобл.), бел. кампазітар. Скончыла Маскоўскі муз.-пед. ін-т імя Гнесіных (1975). З 1975 выкладчык мінскіх ін-та культуры, з 1981 пед. ін-та імя А.Горкага, з 1986 муз. школ. З 1991 кіраўнік створанай ёю першай дзіцячай эстраднай вак. студыі «Званочак». Творам С. уласцівы светлы этычны пачатак, муз. мова апіраецца на традыцыі бел. фальклору, рус. класікі, вызначаецца арыгінальнасцю прыёмаў развіцця мелодыкі, маляўнічасцю гучання, шчырасцю і эмацыянальнасцю. Асобнае месца ў яе творчасці займае музыка для дзяцей, якая вызначаецца меладычнасцю і лірычнай напоўненасцю. Сярод твораў: фантазія «Беларускія Каляды» для сімф. аркестра (1985), канцэрціна для фп., літаўраў і аркестра (1979); творы для фп., трыо для скрыпкі, віяланчэлі і фп. (1977), «Марш-скерцына» для ансамбля скрыпачоў (1986), творы для хору з суправаджэннем, песні, рамансы. У 1994—2000 аўтар і вядучая радыёперадачы «Музычны дамок».



Сярпок звычайны.



Сярпуха зюзнікалістая.



І. **Сярэбраны**. Партрэт кампазітара Дз.Шастаковіча. 1964.

СЯРЭ́БРАНЫ Іосіф Аляксандравіч (25.4.1907, г. Гарадня Чарнігаўскай вобл., Украіна — 12.8.1979), расійскі жывапісец. Нар. маст. СССР (1977). Чл.-кар. АМ СССР (1947). Вучыўся ў Ленінградскім вышэйшым маст.-тэхн. ін-це (1927—31). Выкладаў у Ін-це жывапісу, скульптуры і архітэктуры імя Рэпіна ў Ленінградзе (1948—51 і з 1954). Аўтар твораў, прысвечаных Вял. Айч. вайне («Партызаны-лесагфтаўцы», 1942; «Канцэрт Ленінградскай філармоніі ў 1942 годзе», 1957), партрэтаў («Партызан В.С.Цімачоў», 1943), плакатаў («А ну, узялі!...», 1944). У партрэтах 1960—70-х г. псіхалагічнасць вобраза спалучаецца з манум. значнасцю кампазіцыі: «Партрэт кампазітара Дз.Шастаковіча» (1964), «Хірург П.Купрыяновіч» (1965), «С.Рыхтэр» (1972).

Літ.: Никифоровская И.В. И.А.Серебряный. Л., 1976.

СЯРЭ́БРАНЫ БЛІШЧА́К, другая назва мінералу *аргентыт*.

СЯРЭ́БРАНЫЯ РУ́ДЫ, прыродныя мінер. ўтварэнні, якія выкарыстоўваюць для прамысл. здабычы *серабра*. Гал. мінералы С.р.: *аргентыт*, піраргірыт, полібазіт, прустыт, стэфаніт, срэбразмяшчальны галеніт. Маюць у сябе таксама *серабро самароднае*. Мінім. колькасць серабра ў рудзе для прамысл. здабычы 45—350 г/т. З С.р. здабываюць каля 20% серабра, астатняе — з *поліметалічных руд*, медных і залатых. С.р. звязаны з гранітоідамі, вулканічнымі і субвулканічнымі пародамі. Гал. радовішчы прымеркаваны да т.зв. Вял. сярэбранага пояса Паўн. і Паўд. Амерыкі. Асн. запасы ў ЗША, Канадзе, Перу, Мексіцы.

СЯРЭ́БШЧЫНА, серабшчызна, 1) грашовы падатак у ВКЛ у 14—16 ст. Збіралася з усяго насельніцтва ў манеце («серабром») на карысць дзярж. скарбу, пакуль Казімір IV *Прывілеем 1447* не вызваліў ад яе выплаты баяр. З гэтага часу С. збіралася землеўладальнікамі на сваю карысць. Паступова злілася з інш. грашовай данінай. 2) Надзвычайны дзярж. падатак на ваен. мэты ў 15—16 ст. Выплачвалі землеўладальнікі, дзярж. сяляне, непрывілеяваныя мястэчкі, гарады, якія валодалі палявымі валокамі.

СЯРЭДЗІННААКІЯНІ́ЧНЫЯ ХРЫБТЫ́, магутныя падводныя горныя збудаванні ў межах дна акіянаў, якія найчасцей займаюць пасярэдняе становішча. Назіраюцца ў выглядзе планетарнай сістэмы на дне ўсіх акіянаў. Сумарная даўж. каля 75 тыс. км, шыр. да 2 тыс. км, адносная выш. 1—3 тыс. м. Сістэма С.х. уключае *Гакеля хрыбет*, *Сярэдзінна-Атлантычны хрыбет*, *Цэнтральнаіндыйскі хрыбет* (разам з Аравійска-Індыйскім), *Усходне-Ціхаакіянскае падняцце*. Асобныя вяршыні ўздымаюцца над узр. ак. ў выглядзе вулканічных астравоў (Буве, Св. Алены, Трыстан-да-Кунья і інш.). С.х. характарызуюцца развіццём разрыўных парушэнняў зямной кары, у т.л. вял. папярочнымі разломамі і зрухамі, актыўным вулканізмам і высокай сейсмічнасцю. Уздоўж гал. восі размяшчаюцца рыфтавыя даліны з агаленнямі на дне ультраасн. парод, паводле складу блізкіх да рэчыва мантыі Зямлі.

СЯРЭ́ДЗІННА-АТЛАНТЫ́ЧНЫ ХРЫБЕ́Т, найбуйнейшая горная сістэма дна Атлантычнага ак., частка сусветнай сістэмы *сярэдзіннаакіянічных хрыбтоў*. Агульная даўж. больш за 18 тыс. км. Асобныя ўчасткі маюць уласныя назвы: хрыбты Кніповіча, Мона, Ісландска-Янмаенскі, Рэйк'янес. Паўн.-Атлантычны, Паўд.-Атлантычны, Афрыканска-Антарктычны. Папярочнымі разломамі разбіты на ссунутыя адносна адзін аднаго сегменты, амплітуда перамяшчэнняў дасягае 300—600 км. У Паўд. паўшар'і С.-А.х. больш маналітны, на яго схілах размешчаны падводныя вулканы, вяршыні некат. з

іх утвараюць астравы (напр., Ушэсця, Св. Алены).

СЯРЭ́ДЗІННЫ ХРЫБЕ́Т, Заходні хрыбет, галоўны водападзельны хрыбет на п-ве Камчатка ў Расіі. Даўж. 1200 км. Выш. да 3621 м (вулкан Ічынская Сопка). Складзены з крышт. сланцаў, гнейсаў, пясчанікаў і вулканічных парод. З'яўляецца сістэмай горных ланцугоў і лававых плато. Шмат патухлых вулканаў. Старажытналедавіковыя формы рэльефу (кары, трогі). Ледавікі пл. 866 км^2. У ніжняй ч. схілаў — лясы з каменнай бярозы, кедравага і альховага сланіку; вышэй — горная тундра.

СЯРЭДНЕАЗІЯ́ЦКАЕ ПАЎСТА́ННЕ 1916, выступленне народаў Сярэдняй Азіі і Казахстана супраць рас. царызму, выкліканае ўзмацненнем нац. і калан. прыгнёту ў час 1-й сусв. вайны. Штуршком стаў царскі ўказ ад 8.7.1916 аб мабілізацыі мясц. «іншародніцкага насельніцтва» (раней не падлягала прызыву на ваен. службу) на абарончыя работы: 250 тыс. чал. з Туркестанскага, 140 тыс. са Сцяпнога (Казахскага) краёў. Пачалося 17.7.1916 у Хаджэнце (Худжанд), ахапіла Самаркандскую, Сырдар'інскую, Ферганскую, Акмолінскую, Сяміпалацінскую, Сямірэчанскую, Закаспійскую, Уральскую вобл. з насельніцтвам больш за 10 млн. чал. (узбекі, таджыкі, туркмены, казахі, кіргізы і інш.). Мела пераважна характар сял. вайны, удзельнічалі і гараджане. Працоўныя кідалі работу, насельніцтва ўцякала ў стэпы і за мяжу, адбыліся шматлікія ўзбр. паўстанні супраць рас. адміністрацыі, якія часам суправаджаліся нападамі на рус. паселішчы. Найб. арганізаванае было ўзбр. паўстанне казахаў Тургайскай вобл. на чале з *Амангельды Іманавым*. У студз. 1917 царскія войскі ў асн. ліквідавалі паўстанне, якое часткова сарвала мабілізацыю (да сак. 1917 з Туркестана адпраўлена толькі 123 тыс. чал.).

СЯРЭДНЕВЕНГЕ́РСКІЯ ГО́РЫ, шэраг ізаляваных масіваў (Бакань, Вертэш, Буда і інш.) у Венгрыі, на З ад р. Дунай. Працягваюцца з ПдЗ на ПнУ на 150 км. Выш. 400—700 м. Складзены пераважна з вапнякоў і даламітаў, развіты карст. Стараж. вулканізм. Шыракалістыя лясы. Радовішчы баксітаў, марганцавай руды. Мінер. крыніцы. Ландшафтныя заказнікі (Вертэш, Герэчэ). У межах Буды — частка г. Будапешт.

СЯРЭДНЕГЕРМА́НСКІ КАНА́Л, суднаходны канал у Германіі, які злучае рэкі Эмс, Везер і Эльбу, а праз сістэму каналаў — р. Рэйн з р. Одэр. Даўж. 325 км, мінім. глыб. 3 м; 3 шлюзы, суднапад'ёмнікі, прапускае судны грузападз'ёмнасцю да 1 тыс. т. Адкрыты ў 1938. Канал мае адгалінаванні на Оснабрук, Місбург, Ліндэн, Гільдэсгайм, Зальцгітэр. У 1976 ад С.к. пабудаваны Эльбскі абвадны канал (канал Поўнач—Поўдзень) ад г. Вольфсбург да нізоўяў р. Эльба і далей да ўзбярэжжа Паўн. мора (г. Любек). Гал. парты: Оснабрук, Ганновер, Браўншвайг, Берлін.

СЯРЭДНЕДНЯПРО́ЎСКАЯ КУЛЬТУ́РА, археалагічная культура плямён бронзавага веку, якія ў 2-й пал. 3-га — 1-й пал. 2-га тыс. да н. э. насялялі Верхняе і Сярэдняе Падняпроўе, у т.л. тэр. сучасных Гомельскай, Магілёўскай, часткова Мінскай і Віцебскай абл. Вылучаюць ранні (26—24 ст. да н.э.), сярэдні (23—18 ст. да н.э.) і позні (18—15 ст. да н.э.) этапы. На тэр. Беларусі С.к. пашырылася на сярэднім і познім этапах. Асн. заняткі насельніцтва — земляробства і жывёлагадоўля, дадатковыя — рыбалоўства, паляванне і збіральніцтва.



Да арт. **Сярэднедняпроўская культура**: посуд 2-га (верхнія 3 рады) і 3-га этапаў.

Паселішчы размяшчаліся на пясчаных дзюнах, узвышэннях поймы, на краях тэрас і на ўчастках карэннага берага. Жытлы наземныя слупавой канструкцыі і паўзямлянкі, унутры мелі агнішчы. Пахавальны абрад — трупапалажэнне ў скурчаным стане на баку ў авальных або прамавугольных ямах і трупаспаленне на курганных могільніках. Насельніцтва С.к. вырабляла гаршкі, кубкі, слоікі, чашы з шара- і яйцападобным тулавам, слоікападобныя пласкадонныя пасудзіны і інш. У глінянае цеста дамешвалі пясок, шамот і дробны кварц. Верхняя частка посуду звычайна ўпрыгожвалася адбіткамі шнура, лінейнага і зубчастага штампа, наразнымі лініямі, уцісканнямі, зашчыпамі і інш. элементамі, якія ўтваралі гарыз. і дыяганальныя рады арнаментаў, трохвугольныя кампазіцыі. Плямёны С.к. карысталіся крамянёвымі і касцянымі прыладамі працы (сякеры, скрабкі, скоблі, нажы, сярпы, цёслы і інш.), меднымі і бронзавымі ўпрыгожаннямі (дыядэмы, шыйныя грыўні, бранзалеты, трубчастыя пранізкі, скроневыя кольцы, бурштынавыя падвескі). Найб. вядомыя помнікі С.к. на Беларусі *Ксяндзова Гара*, *Струмень*, Рудня-Шлягіна, Сябровічы, *Ходасавічы*.

Літ.: Археалогія Беларусі. Т. 1. Мн., 1997.

А.Г.Калечыц.

СЯРЭДНЕДУНА́ЙСКАЯ РАЎНІ́НА, Венгерская нізіна. Знаходзіцца ў бас. сярэдняга цячэння р. Дунай (ад Венскага Лесу на ПнЗ да Жалезных Варот на ПдУ), пераважна ў Венгрыі, часткова ў Аўстрыі, Славакіі, Румыніі, Сербіі, Харватыі. Асобныя часткі С.р. наз. Альфёльд, Дунантуль, Кішальфёльд. Пл. каля 200 тыс. км^2. Выш. 100—200 м. Тэктанічная ўпадзіна, запоўненая лёсавымі і алювіяльнымі адкладамі. Паверхня плоская або слаба ўзгорыстая, астраўныя горы (выш. да 757 м). Сярэднія т-ры студз. -2 °С, ліп. 22 °С. Ападкаў 500—600 мм, у гарах да 900 мм за год. На тэр. С.р. воз. Балатан з курортным раёнам. Участкі лесастэпаў і стэпаў. Інтэнсіўнае земляробства (пасевы пшаніцы, кукурузы; садаводства, вінаградарства). Радовішчы баксітаў, нафты і газу, бурага вугалю. Буйны горад — Будапешт.

СЯРЭДНЕІРА́НСКІЯ ГО́РЫ, горная сістэма ў Іране. Даўж. з ПнЗ на ПдУ каля 1000 км, шыр. да 300 км, выш. да 4420 м (г. Хезар), пераважаюць выш. 2000—2500 м. Гал. хр. — Кухруд. Складзены з вулканічных парод, пясчанікаў, вапнякоў; шматлікія восыпы. Ападкаў 100—300 мм за год. Горныя стэпы і пустыні. Па далінах — тугайныя зараснікі. Качавая жывёлагадоўля.

СЯРЭДНЕСІБІ́РСКАЕ ПЛАСКАГО́Р'Е, у Азіі на тэр. Расійскай Федэрацыі. Займае пераважную ч. Усх. Сібіры ў Рэспубліцы Саха (Якуція), Краснаярскім краі і Іркуцкай вобл. Абмежавана на Пд хр. Усх. Саяна, Прыбайкалля і Забайкалля, на З — Зах.-Сібірскай раўнінай, на Пн і У — Паўн.-Сібірскай нізінай і Цэнтральнаякуцкай раўнінай. Пл. каля 3,5 млн. км^2. Знаходзіцца ў межах *Сібірскай платформы*. Пераважаюць выш. 500—700 м. Характэрна чаргаванне шырокіх плато і кражаў (Енісейскі краж, Вілюйскае плато; найб. выш. 1701 м — на плато Путарана).

Распаўсюджана шматгадовая мерзлата. Клімат рэзка кантынентальны. Радовішчы карысных выкапняў: нікелевыя і медныя руды (Нарыльск), жал. руды (Ангара-Піцкі басейн і Ангара-Ілімскі р-н), кам. вугаль (Тунгускі, Чаромхаўскі і інш. басейны), алмазы, графіт, кам. соль, прыродны газ. Рэкі бас. Паўн. Ледавітага ак.; буйнейшыя — Ніжняя і Падкаменная Тунгускі, Ангара, Лена з Вілюем, Хатанга. Пераважае лістоўнічная тайга; на Пд хваёва-лістоўнічныя і хваёвыя бары. На Пн горная тундра, на Пд у далінах участкі лесастэпу і стэпаў. Ёсць заказнікі і запаведнікі.

СЯРЭ́ДНІ ЗАРАБО́ТАК, сярэдні памер *заработнай платы* работніка за пэўны перыяд. Выплачваецца ў прадугледжаных заканадаўствам выпадках. Паводле Прац. кодэкса Рэспублікі Беларусь С.з. захоўваецца за работнікамі ў перыяд выканання дзярж. ці грамадскіх абавязкаў, пераезду на работу ў інш. мясцовасць, вымушанага прагулу і інш. На аснове С.з. разлічваюцца *пенсіі*, *выхадныя дапамогі*, дапамогі па беспрацоўі і стыпендыі беспрацоўным, якія праходзяць прафес. падрыхтоўку ці перападрыхтоўку.

СЯРЭ́ДНІ МОЗГ, аддзел *галаўнога мозга*, размешчаны паміж *прамежкавым мозгам* і вароліевым мостам. Складаецца з чатырохбугровага цела (падкоркавыя цэнтры зроку і слыху) і ножак мозга. Гал. ўтварэнні: цэнтр. шэрае рэчыва, чорная субстанцыя, чырв. ядро, ядры вокарухальнага і адводнага нерваў, рэтыкулярная фармацыя; цэнтры, якія рэгулююць тонус шкілетных мышцаў, стан сну і няспання і інш. Поласць С.м. — водаправод мозга, злучае III і IV жалудачкі мозга. Асн. эферэнтны шлях С.м. (перадае імпульсы ад нерв. цэнтраў да розных органаў) — рубраспінальны тракт, які забяспечвае павышэнне каардынацыі рухаў з боку мазжачка і С.м., іх адаптацыі да вестыбулярных, светлавых і гукавых уздзеянняў. Пры пашкоджанні чорнай субстанцыі ўзнікае дэфіцыт нейрамедыятара дофаміна (адна з прычын парушэнняў позы, рэгуляцыі рухаў, мышачнага тонусу — сімптомы паркінсанізму). *А.С.Леанцюк.*

СЯРЭ́ДНІ УСХО́Д (англ. Middle East, франц. Moyen Orient) у рускамоўнай л-ры ў большасці выпадкаў — умоўная назва раёна Азіі, на тэр. якога знаходзяцца Іран і Афганістан; у заходняй л-ры да С.У. адносяць таксама краіны *Блізкага Усходу*.

СЯРЭ́ДНІЯ ВЕЛІЧЫ́НІ ў статыстыцы, абагульненыя характарыстыкі якасна аднародных і колькасна розных велічынь. Выкарыстоўваюцца для пазбаўлення ад індывід. адрозненняў элементаў пэўнай сукупнасці, выяўлення агульных умоў і заканамернасцей. З дапамогай С.в. ажыццяўляюцца разлікі, звязаныя з прагназіраваннем і планаваннем, аналіз пэўных з'яў і працэсаў. Пры аналізе сац. з'яў і працэсаў разлік С.в. выступае як дапаможны метад для пераходу да метадаў *мнагамернага статыстычнага аналізу*. Існуюць розныя тыпы С.в.: сярэднія арыфм., сярэднія гарманічныя, сярэднія геам., сярэднія квадратычныя (гл. *Сярэдняе*).

СЯРЭ́ДНІЯ ВЯКІ́, сярэдневякоўе, сярэднявечча, назва эпохі паміж старажытнасцю (*антычнасцю*) і *Адраджэннем*. Уведзена ва ўжытак італьян. гуманістамі 15—16 ст., якія імкнуліся супрацьпаставіць свой час папярэднім стагоддзям, што трактаваліся імі як перыяд заняпаду культуры. У адрозненне ад «цёмнай», «варварскай» эпохі, што настала пасля росквіту культуры ў класічнай старажытнасці (Грэцыя і Рым), новыя часы лічыліся перыядам адраджэння антычнасці. У паняцце «С.в.» ўкладваўся адмоўны сэнс. Пасля таго, як у 1685 ням. гісторык Х.Келарыус (Келер) выдаў падручнік па універсальнай гісторыі, у якім падзяліў мінулае на старажытнасць, С.в. і новы час, 3-членная схема перыядызацыі і тэрмін «С.в.» трывала ўвайшлі ў гістарыяграфію. У 18 ст. аформілася асобная гіст. дысцыпліна, што вывучае С.в. — *медыявістыка*.

У еўрап. гуманістыцы лічыцца, што ў вузкім значэнні слова паняцце «С.в.» тычыцца толькі тых тэрыторый, якія зведалі Адраджэнне (г.зн. уласна Еўропы), а ў дачыненні да іншых гаварыць пра С.в. можна толькі ўмоўна. Храналагічныя межы эпохі вызначаюцца парознаму. Звычайна яе пачынаюць ад канца 4—5 ст. (у франц. гістарыяграфіі ад 395 — года смерці імператара Феадосія Вялікага, у нямецкай — ад 476 — краху Зах. Рымскай імперыі), а завяршаюць сярэдзінай 15 — пач. 16 ст. (1453 — крах Візантыйскай імперыі, 1492 — адкрыццё Амерыкі, 1517 — выступленне М.Лютэра і інш.). У межах гэтай эпохі вылучаюць 3 падэпохі: ранняя С.в. (канец 4—11 ст.), высокія С.в. (11 — 1-я пал. 13 ст.) і познія С.в. (2-я пал. 13 — пач. 16 ст.). У сучаснай зах. гістарыяграфіі прызнаецца, што паміж С.в. і новым часам існавала пераходная эпоха — прыкладна паміж 1450 і 1550. У бел. падручніках па гісторыі ў адпаведнасці з «Праграмай па гісторыі для базавых агульнаадукацыйных школ» (1996) прынята траічная схема перыядызацыі з такімі ж храналагічнымі межамі, як у Зах. Еўропе. Аднак праўамернасць вызначэння межаў С.в. як 5—15 ст. ў дачыненні да гісторыі Беларусі аспрэчваецца ў навук. л-ры.

Асн. прыкметамі С.в. прынята лічыць існаванне васальна-ленной сістэмы (гл. *Васалітэт*) і *феадалізму* як асаблівага тыпу грамадскага ладу. Эпоху характарызавалі панаванне *натуральнай гаспадаркі* і падзеленасць свету на мноства малых, практычна аўтаномных гасп. рэгіёнаў, а таксама поўная перавага рэліг. светапогляду. Паколькі ў гаспадарцы, формах грамадскага жыцця і асабліва ў менталітэце С.в. вызначалі еўрап. культуру і пасля 16 ст., прадстаўнікі «школы «Аналаў» увялі канцэпцыю «працяглага сярэдневякоўя», згодна з якой С.в. доўжыліся да 18—19 ст.

Літ.: Ле Гофф Ж. Цивилизация средневекового Запада: Пер. с фр. М., 1992; Сагановіч Г. У пошуках Сярэднявечча // Бел. гіст. агляд. 1997. Сш. 1—2; Dinzelbacher R. Sachwörterbuch der Mediävistik. Stuttgart, 1992; Sauer H. Mittelalter // Leksikon des Mittelalters. Berlin, 1993. Bd. 6; Goetz H.-W. Moderne Mediävistik: Stand und Perspektiven der Mittelalterschung. Darmstadt, 1999. *Г.М.Сагановіч.*

СЯРЭ́ДНІЯ ГО́РНЫЯ ПАРО́ДЫ, *магматычныя горныя пароды*, якія па колькасці крэменязёму (53—64 ± 2%) займаюць прамежкавае становішча паміж *кіслымі горнымі пародамі* і *асноўнымі горнымі пародамі*. Паводле хім. і мінер. саставу падзяляюцца на нармальныя (*дыярыты* і іх эфузіўны аналаг андэзітабазальты, кварцавыя дыярыты і іх эфузіўны аналаг *андэзіты*) і субшчолачныя (вапнава-шчолачныя *сіеніты* і іх эфузіўны аналаг *трахіты*). Часта вылучаюць шчолачную галіну С.г.п. (шчолачныя сіеніты і шчолачныя трахіты).

СЯРЭ́ДНІЯ ПЕ́ЧЫ, вёска ў Сіманіцкім с/с Лельчыцкага р-на Гомельскай вобл. Цэнтр дапаможнай гаспадаркі. За 14 км на ПнЗ ад г.п. Лельчыцы, 221 км ад Гомеля, 67 км ад чыг. ст. Ельск. 332 ж., 121 двор (2002). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі.

СЯРЭ́ДНІЯ СПЕЦЫЯ́ЛЬНЫЯ НАВУЧА́ЛЬНЫЯ ЎСТАНО́ВЫ. Рыхтуюць спецыялістаў сярэдняй кваліфікацыі для прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў розных галін эканомікі, культуры, адукацыі, аховы здароўя і інш. Да С.с.н.у. належаць *тэхнікумы*, *каледжы* і вучылішчы (пед., мед., муз., культуры, мастацкія, мастацтваў). У навуч. планы ўваходзяць агульнаадук. дысцыпліны (л-ра, матэматыка, фізіка, хімія і інш.) і прафесійныя. Тэрмін навучання ад 1 г. 10 мес да 4 гадоў. У 2001/02 навуч. г. на Беларусі дзейнічала 148 дзярж. і 8 прыватных С.с.н.у. (гл. таксама *Сярэдняя спецыяльная адукацыя*).

СЯРЭ́ДНІЯ СУ́ТКІ, гл. ў арт. *Суткі*.

СЯРЭ́ДНІЯ ШЫРО́ТЫ, тое, што *ўмераныя шыроты*.

СЯРЭ́ДНЯГО́РНЫ РЭЛЬЕ́Ф, сярэднягор'і, сярэднявышынныя горы, тып рэльефу, уласцівы гарам з адноснымі вышынямі 500—2000 м, а абсалютныя вышыні звычайна ніжэй за 3000 м (напр., Карпаты, Урал, Апалачы). Характэрны мяккія абрысы грабянёў, акруглыя вяршыні, адносна пакатыя схілы, участкі паверхняў выраўноўвання. У фарміраванні рэльефу вядучую ролю адыгрываюць эразійныя працэсы. Шырока распаўсюджаны рыхлыя адклады, схілы здзірванелыя, часта парослыя лесам. Горы звычайна не дасяга-

ють снегавой лініі і пазбаўлены ледавіковых форм рэльефу.

СЯРЭ́ДНЯЕ, сярэдняе значэнне, лікавая характарыстыка групы лікаў ці функцый. Выкарыстоўваецца ў практыцы вымярэнняў і вылічэнняў фіз. велічынь, матэм. статыстыцы і інш. раздзелах матэматыкі.

С. групы лікаў — лік, што знаходзіцца паміж найменшым і найбольшым з іх. Найб. пашыраны: С. арыфм. $x = (x_1 + x_2 + ... + x_n)/n$, С. геам. $g = \sqrt[n]{x_1 x_2 ... x_n}$, С. гарманічнае $h = n/(1/x_1 + 1/x_2 + ... 1/x_n)$ і С. квадратычнае $\sqrt{(x_1^2 + x_2^2 + ... + x_n^2)/n}$. С. функцыі — лік, што знаходзіцца паміж найменшым і найбольшым яе значэннямі, і для функцыі, зададзенай на адрэзку $[a,b]$, выражаецца праз вызначаны інтэграл $f = \frac{1}{b-a}\int_a^b f(x)\,dx$. Аналагічна вызначаецца С. функцый некалькіх пераменных у некаторай вобласці.

СЯРЭ́ДНЯЕ ВО́ЗЕРА. У Талачынскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Еленка, за 25 км на ПдЗ ад г. Талачын. Пл. 0,27 км², даўж. 680 м, найб. шыр. 600 м, даўж. берагавой лініі 1,95 км. Схілы катлавіны выш. да 2 м, пад лесам. Берагі нізкія, месцамі забалочаныя. Востраў пл. 0,1 га. Злучана ручаём з Касмачэўскім возерам.

СЯРЭДНЯНЁМАНСКАЯ НІЗІ́НА. Размешчана на З Беларусі, на ПнЗ Гродзенскай вобл., таксама на тэр. Польшчы і Літвы. Мяжуе з Гродзенскім узв., Лідскай раўнінай і Верхнянёманскай нізінай. На тэр. Беларусі даўж. з З на У 60—75 км, з Пн на Пд да 45 км, пл. каля 1,7 тыс. км². Выш. 110—140 м.

Прымеркавана да Мазурска-Беларускага пахаванага выступу *Беларускай антэклізы*. Крышт. фундамент залягае на глыб. 100—300 м. Месцамі перакрыты юрскімі (магутнасць да 40 м), познемелавымі (больш за 100 м), палеагенавымі (да 20 м) і антрапагенавымі (60—140 м) адкладамі. На паверхні пераважаюць флювіягляцыяльныя і лімнагляцыяльныя пяскі, жвір, радзей жвірова-галечныя сумесі, галацэнавыя азёрныя і балотныя адклады. На фарміраванне рэльефу значна паўплываў паазерскі ледавік, у час растання якога ў межах С.н. ўтварылася вял. прыледавіковае Сярэднянёманскае воз. Пры адступанні паазерскага ледавіка ўзровень возера паніжаўся са 123 м да 115 м. У больш позні галацэнавы час сфарміравалася даліна р. Нёман, якая ў межах С.н. мае эразійны ўрэз да 25—28 м.

Сучасны рэльеф С.н. — зандравая раўніна з 2 узроўнямі (больш высокі 130—140 м прымыкае да Лідскай раўніны). Паверхня плоская, плоскаўзгорыстая, ускладнена тэрмакарставымі западзінамі, эолавымі формамі, невял. зарастаючымі азёрамі. Карысныя выкапні: гліны, буд. пяскі, торф. Т-ра студз. -5,1 °С, ліп. 18 °С. Ападкаў 545 мм за год. Гал. р. Нёман з прытокамі Котра (з Пыранкай і Нявішай), Гожка, Чорная Ганча. Найб. азёры Белае, Рыбніца, Берштаўскае, Вераўскае, Зацкава. Глебы пераважна дзярнова-падзолістыя, часта забалочаныя, тарфяна-балотныя, поймавыя. Лясістасць каля 40%. Пашыраны хваёвыя, бярозавыя, яловыя і чорнаальховыя лясы. Найб. лясныя масівы Гродзенская і Катранская пушчы. У межах С.н. заказнікі рэсп. значэння: біял. *Гожаўскі*, *Парэцкі* і *Сапоцкінскі*, ландшафтны Азёры.

В.Р.Сінякова.

СЯРЭДНЯРУ́СКАЕ ЎЗВЫ́ШША. У Расійскай Федэрацыі, часткова на ПнУ Украіны, на Усх.-Еўрапейскай раўніне, ад шыротнага адрэзка даліны р. Ака на Пн да Данецкага кража на Пд. Даўж. каля 1000 км, шыр. 500 км, выш. да 293 м. Паўд.-ўсх. частка — Калацкае ўзвышша. Складзена з вапнякоў, мелу і мергелю, перакрытых пясчана-гліністымі і лёсавымі адкладамі. Пераважае ўзгорыста-лагчынны рэльеф; месцамі развіты карст. Буйныя рэкі: Ака, Дзясна, Сейм, Псёл, Дон. Шыракалістыя лясы на Пд пераходзяць у стэп, які амаль цалкам разараны. Запаведнікі: Цэнтральначарназёмны і Галічча Гара.



Сярэднянёманская нізіна ў Гродзенскім раёне.

СЯРЭ́ДНЯЯ АГУЛЬНААДУКАЦЫ́ЙНАЯ ШКО́ЛА, асноўны тып установы адукацыі, які забяспечвае атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі.

На фарміраванне еўрап. С.а.ш. паўплывала ант. традыцыя (гл. *Класічная адукацыя*), што абумовіла перавагу гуманітарных ведаў у змесце адукацыі і вызначыла назву школы — *гімназія* (у Еўропе пашырана з 16 ст.). Развіццё індустр. грамадства садзейнічала ўзнікненню ў 18 ст. новага тыпу С.а.ш. — *рэальных навучальных устаноў*, дзе пераважала вывучэнне прыродазнаўчых, дакладных і прыкладных навук, новых моў. Гэтыя тыпы С.а.ш. з рознымі варыянтамі інтэграцыі захаваліся ў большасці еўрап. краін і ў наш час.

На Беларусі пасля 1918 установлены адзіны тып 9-гадовай дзярж., прац. політэхн. школы. У 1932 адбыўся пераход да 10-гадовай політэхн. С.а.ш. У 2-й пал. 1950-х г. у С.а.ш. ўведзены элементы вытв. навучання, у 1959 яна пераўтворана ў прац. політэхн. с.а.ш. з вытв. навучаннем (тэрмін навучання 11 гадоў). У 1966 С.а.ш. зноў стала 10-гадовай. У 1984 здзейснены пераход да 11-гадовай агульнаадук. школы. У канцы 1980—пач. 1990-х г. з'явіліся гімназіі, ліцэі. З 1998 пачалася рэформа С.а.ш. У межах яе рэалізацыі ўведзены абавязковая 10-гадовая і 12-гадовая агульная сярэдняя адукацыя. Структура С.а.ш. ўключае: 4-гадовую пач. адукацыю (падрыхтоўчы, 1—3-і класы; дзеці ад 6 да 10 гадоў), 6-гадовую базавую (4—9-ы класы; з 10 да 16 гадоў) і агульную сярэднюю адукацыю на базе ліцэйскіх класаў (10—11-ы класы; 17—18 гадоў). Удасканаленне зместу адукацыі ў С.а.ш. накіравана на забеспячэнне гарманічнага развіцця асобы, авалоданне ёю асновамі нац. і сусв. культуры, падрыхтоўку да самаст. жыцця. Для гэтага ўкараняюцца новыя адукац. тэхналогіі. У 2001/02 навуч. г. ў Рэспубліцы Беларусь было 2770 дзённых С.а.ш. (больш за 1,26 млн. вучняў) і 86 вячэрніх зменных (каля 23,4 тыс. навучэнцаў). Гл. таксама *Сярэдняя адукацыя*.

М.І.Ліс.

СЯРЭ́ДНЯЯ АДУКА́ЦЫЯ, узровень адукацыі, які забяспечвае свядомы, актыўны ўдзел чалавека ў жыцці грамадства, садзейнічае яго самаст. прафес. дзейнасці і дае аснову для атрымання *вышэйшай адукацыі*. Адрозніваюць агульную С.а. і *сярэднюю спецыяльную адукацыю*. Мэта агульнай С.а. — станаўленне асобы і яе светапогляду, усведамленне ёю цэласнай карціны свету і свайго месца ў ім, уключаючы выбар жыццёвага шляху. Папярэднічае С.а. дашкольная і пач. школьная адукацыя. Агульную С.а. даюць *сярэднія агульнаадукацыйныя школы*, *гімназіі*, *ліцэі*, некаторыя *сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы* і прафес.-тэхн. вучылішчы. Гл. таксама *Адукацыя агульная*.

СЯРЭ́ДНЯЯ А́ЗІЯ, частка тэр. Азіі ад Каспійскага м. на З да граніцы з Кітаем на У і ад Арала-Іртышскага водападзела

на Пн да граніцы з Іранам і Афганістанам на Пд. Прырода адрозніваецца вял. кантрастнасцю: найвыш. горныя сістэмы — *Цянь-Шань* і *Памір*, вял. раўнінныя прасторы *Туранскай нізіны* з пустынямі *Каракумы* і *Кызылкум*, на Пн — *Тургайскае плато* і *Казахскі драбнасопачнік*. Каля ўзбярэжжа Каспійскага мора ўпадзіна Карагіе (-132 м). С.А. — вобласць унутр. сцёку. Гал. рэкі (Амудар'я, Сырдар'я, Ілі) упадаюць у буйнейшыя азёры — Аральскае мора і Балхаш. На раўнінах пераважаюць пустынныя ландшафты, у гарах — ландшафты зменьваюцца ў залежнасці ад вышыннай пояснасці і экспазіцыі схілаў ад пустынных падгорных раўнін да халодных пустынь і ледавікоў.

Тэрмін С.А. ўведзены ў рускамоўны ўжытак у сярэдзіне 19 ст. і звязаны з творамі ням. вучонага А.Гумбальта, які называў вялізны рэгіён унутры кантынент. Азіі па-нямецку «Mittelasien», што мае дваякі пераклад: «Цэнтр. Азія», або «С.А.»; у рускамоўнай л-ры ўжываліся абедзве назвы. Пасля заваявання Расіяй Туркестана (2-я пал. 19 ст.) С.А. сталі наз. толькі рас. ўладанні Цэнтр. Азіі, а раёны на У ад іх — Цэнтр. Азіяй. У сав. час сярэднеазіяцкімі наз. 4 саюзныя рэспублікі: Узбекістан, Кіргізія, Таджыкістан і Туркменістан. У 1993 на нарадзе кіраўнікоў дзяржаў і ўрадаў Казахстана, Узбекістана, Кіргізіі, Таджыкістана і Туркменістана вырашана адмовіцца ад тэрміна «С.А.» і называць гэты рэгіён (цяпер з 5 рэспублік СНД) Цэнтр. Азіяй. Але назва «С.А.» да нашага часу выкарыстоўваецца ў беларускамоўнай і рускамоўнай л-рах.

СЯРЭ́ДНЯЯ БРА́ГІНКА, назва р. *Брагінка* ў сярэднім цячэнні.

СЯРЭ́ДНЯЯ ЛІТВА́ (Litwa Srodkowa), Усходняя Літва, польская марыянетачная дзяржава на тэр. Віленшчыны і Гродзеншчыны ў 1920—22. Утворана з мэтай далучэння да Польшчы Віленшчыны, якая паводле ўмоў польска-літоўскага пагаднення, падпісанага 7.10.1920 у г. Сувалкі, вызначалася як тэр. Літвы. Уключала Ашмянскі, Свянцянскі, Трокскі, Віленскі, Браслаўскі і Лідскі пав., захопленыя ў кастр. 1920 войскамі ген. Л.Жалігоўскага па загадзе Ю.Пілсудскага. Тэр. С.Л. складала каля 10 тыс. км^2 і налічвала 530 тыс. ж., з якіх больш за 40% былі беларусы. Вярх. ўлада ў С.Л. знаходзілася ў руках ген. Жалігоўскага, функцыю ўрада выконвала Часовая кіруючая камісія, гал. задачамі якой было забеспячэнне паліт. і эканам. стабільнасці краю. На тэр. С.Л. была створана самаст. судовая сістэма. С.Л. залежала ад грашовых крэдытаў польскага ўрада, а яе эканоміка — ад стану гаспадаркі Польшчы і польскай маркі. На тэр. С.Л. на працягу 1921 пачалі дзейнічаць 432 прамысл. і каля 1370 дробных прадпрыемстваў. Асн. прадметам экспарту была прамысл. сыравіна (дрэва, лён і інш.). Улады С.Л. распрацавалі праект электрыфікацыі краю. Беспаспяхова скончылася спроба правядзення зямельнай рэформы, якая мела на мэце аслабленне сац. напружання на вёсцы. На тэр. С.Л. дзейнічалі і бел. арг-цыі, у т.л. *Беларускі нацыянальны камітэт* у Вільні, *Беларуская партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў*, група былых слуцкіх паўстанцаў пад кіраўніцтвам У.Пракулевіча і П.Жаўрыда, бел. камуністы на чале з К.Цярэшчанкам і Э.Русецкім, паланафільская арг-цыя «Беларуская краёвая сувязь» (кіраўнік П.Аляксюк), якая выказвалася за далучэнне С.Л. да Польшчы. У канцы 1920 заснавана бел. *Барунская настаўніцкая семінарыя*, працягвала працаваць *Віленская беларуская гімназія*. У 1921 па ініцыятыве Б.Тарашкевіча створана *Таварыства беларускай школы*, дзейнічала 186 бел. школ. Каб надаць выгляд законнасці далучаных да Польшчы тэрыторый, 8.1.1922 польскі ўрад арганізаваў выбары ў часовы сейм С.Л. У выбарах прынялі ўдзел 64,4% выбаршчыкаў. Большасць бел. і літ. насельніцтва байкатавала выбары, якія сталі перамогай прыхільнікаў інкарпарацыі. Паводле рашэння часовага сейма



ад 20.2.1922 С.Л. ўвайшла ў склад Польскай дзяржавы і была ўключана ў *Віленскае ваяводства*. Гэта стала адной з падстаў *Віленскага канфлікту 1920—39*. У час уз'яднання Заходняй Беларусі з БССР у вер. 1939 Віленскае ваяв. было занята Чырв. Арміяй. Згодна з сав.-літ. дагаворам ад 10.10.1939 тэр. яго з Вільняй, Віленска-Трокскі і частка Свянцянскага пав. перададзены Літве (агульная пл. 6909 км^2 з нас. 490 тыс. чал.). У жн. і ліст. 1940 Літ. ССР перададзена яшчэ больш за 2600 км^2 тэр. БССР. На астатняй тэр. Віленшчыны ў снеж. 1939 утворана *Вілейская вобласць*.

Літ.: Грыцкевіч А. Беларуска-літоўскія дачыненьні 1918—1922 гг. // Спадчына. 1994. № 5; Іваноў М. Праблема прыналежнасці Вільні і беларускае нацыянальнае пытанне ў 1939 г. // Бел. гіст. часоп. 1994. № 1; Зинкявичюс З. Восточная Литва в прошлом и настоящем: Пер. с лит. Вильнюс, 1996; Знешняя палітыка Беларусі. Т. 1—2. Мн., 1997—99; Dominiczak H. Granica wschodnia Rzeczypospolitej Polskiej w latach 1919—1939. Warszawa, 1992. *А.М.Чарнякевіч.*

СЯРЭ́ДНЯЯ ПРЫПЯЦЬ, ландшафтны заказнік рэсп. значэння на тэр. Пінскага, Лунінецкага, Столінскага р-наў Брэсцкай вобл. і Жыткавіцкага р-на Гомельскай вобл. Засн. ў 1999 для аховы унікальнай поймавай экасістэмы р. *Прыпяць* з комплексамі рэдкіх і знікаючых відаў раслін і жывёл. Пл. 90 447 га. У С.П. увайшлі заказнікі Нізоўе Ясельды, Нізоўе Случы, Вусце Лані. Уключае тыповыя для Палесся біятопы: спелыя дубровы, нізінныя балоты, лугі, воднабалотныя ўгоддзі. Лясы займаюць 21,4% пл., лугі, балоты — 38,1%, хмызнякі — 12,2%, водныя ўгоддзі — 5%. Лясы 11 фармацый з высокаўзроставымі дубровамі, ясеннікамі, чорнаалешнікамі. Травяністыя згуртаванні зуброўкі духмянай, булаваносцу сіваватага, асакі омскай. У флоры 725 відаў, у т.л. 11 відаў у Чырв. кнізе: сальвінія плывучая, гарлачык белы, зубніца клубняносная, шпажнік чарапіцавы, касач сібірскі і інш. У фауне 36 відаў млекакормячых, 182 — птушак, 6 — рэптылій, 10 — амфібій, 37 — рыб, у т.л. ў Чырв. кнізе 57 відаў: барсук, змеяед, шылахвостка, чэрнець белавокая, падворлікі вялікі і малы, арлан-белахвост, пугач, чапля вялікая белая, кваква, чарапаха балотная, рапуха чаротная і інш. *П.І.Лабанок.*

СЯРЭ́ДНЯЯ СПЕЦЫЯ́ЛЬНАЯ АДУКА́ЦЫЯ, узровень адукацыі, які набываецца на базе поўнай або няпоўнай агульнай сярэдняй адукацыі, а таксама пачатковай прафес. адукацыі і забяс-



Поймавае возера ў заказніку **Сярэдняя Прыпяць**.

печвае індывіду веды, уменні і навыкі, неабходныя для самаст. выканання работ пэўнай складанасці, кіраўніцтва першаснымі вытв. звёнамі, дапамогі спецыялістам вышэйшай кваліфікацыі. С.с.а. даюць *сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы*, вышэйшыя прафес. вучылішчы, прафес.-тэхн. каледжы і вышэйшыя каледжы (гл. таксама раздзел Асвета ў арт. *Беларусь*).

СЯРЭ́ДНЯЯ ТУНГУ́СКА, адна з назваў р. *Падкаменная Тунгуска*.

СЯРЭ́ДНЯЯ ШКО́ЛА, навучальная ўстанова, якая забяспечвае агульную сярэднюю адукацыю, тое, што *сярэдняя агульнаадукацыйная школа*.

СЯСІ́ТА, возера ў Гарадоцкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Ловаць (цячэ праз возера), за 43 км на ПнУ ад г. Гарадок. Пл. 3,45 км^2, даўж. 4,6 км, найб. шыр. 1,3 км, найб. глыб. 10,6 м, даўж. берагавой лініі 12,8 км, пл. вадазбору 370 км^2. Катлавіна лагчыннага тыпу. Схілы выш. 5—10 м (на У 3—5 м), разараныя. Адзначаны 2 тэрасы на выш. 2 і 5 м. Берагі нізкія, на У месцамі да 0,5 м, параслі хмызняком і водна-балотнай расліннасцю. Пойма шыр. 10—50 м (на ПдЗ да 200 м), забалочаная, пад хмызняком. Мелкаводдзе пясчанае, глыбей 2 м дно выслана ілам. Мноства водмелей і ўпадзін. Востраў пл. 1 га. Уздоўж берагоў да глыб. 1—1,2 м паласа надводнай расліннасці шыр. да 30 м. У выніку меліярац. работ у бас. р. Ловаць узровень возера паніжаны на 1,2—1.5 м.

СЯСЛА́ВІН Аляксандр Мікітавіч (1780 ці 1785, с. Есемава, цяпер с. Сяслаўіна Ржэўскага р-на Цвярской вобл., Расія — крас. 1858 або 7.5.1857), герой вайны 1812. Ген.-лейт. (1814). Скончыў артыл. і інж. кадэцкі корпус (1798). Удзельнік рус.-франц. 1806—07 і рус.-тур. 1806—12 войнаў. У пач. вайны 1812 ад'ютант ген. М.Б.Барклая-дэ-Толі, удзельнік Смаленскай і Барадзінскай бітваў. З вер. 1812 камандзір кав. партыз. атрада. 28 ліст. яго атрад першы ўвайшоў у Барысаў, захапіў шмат палонных, наладзіў сувязь паміж войскамі П.Х.*Вітгенштэйна* і П.В.*Чычагова*; 4 снеж. першы ўварваўся ў Ашмяны, дзе разлічваў захапіць Напалеона I; 8 снеж. беспаспяхова атакаваў Вільню. Са снеж. 1812 флігель-ад'ютант імператара *Аляксандра I*, камандзір гусарскага палка. Удзельнік замежных паходаў рас. арміі 1813—14. Вызначыўся ў *Лейпцыгскай бітве 1813*, за што атрымаў званне генерала. Да 1820 у арміі, потым у маёнтку на радзіме. *А.М.Лукашэвіч.*

СЯТКО́ЎСКІ Валянцін Аляксандравіч (н. 21.4.1946, г. Докшыцы Віцебскай вобл.), бел. вучоны ў галіне паталаг. фізіялогіі. Д-р мед. н. (1992). Скончыў Мінскі мед. ін-т (1970). У 1970 — 89 у Бел. НДІ пералівання крыві (у 1977—89 нам. дырэктара). З 1990 у Мінскім мед. ун-це (з 2000 кіраўнік навук. групы). Навук. працы па пытаннях паталаг. фізіялогіі сістэмы крыві, дыягностыцы і тэрапіі псіхасаматычных хвароб. Прэмія Ленінскага камсамола Беларусі 1978.

Тв.: Применение теории информации при психодиагностических исследованиях (разам з Л.А.Азаравай, Л.П.Васіленка) // Мед. новости. 1997. № 12; Психосоматические заболевания: современ. взгляд на развитие и состояние проблемы (у сааўт.) // Там жа. 1999. № 4.

СЯЎБА́ сельскагаспадарчых раслін, працэс размеркавання насення ў верхнім слоі глебы для яго прарастання; адзін з прыёмаў *агратэхнікі* ў раслінаводстве. Механізаваную С. праводзяць *сеялкамі* і інш. Дастатковае забеспячэнне праросткаў вільгаццю, цяплом і паветрам дасягаецца добрай перадпасяўной апрацоўкай глебы, спосабамі і аптымальнымі тэрмінамі С., глыбінёй загортвання насення, нормамі высеву, унясеннем ўгнаенняў і інш.

Перадпасяўная апрацоўка глебы захоўвае вільгаць у глебе, ачышчае поле ад пустазелля, забяспечвае неабходную рыхласць глебы; яе прыёмы (баранаванне, культывацыя, шлейфаванне, прыкачванне) і іх паслядоўнасць залежаць ад клімат., глебавых умоў і с.-г. культуры. Спосабы С. выбіраюцца з улікам біял. патрабаванняў с.-г. культур да плошчы жыўлення, асвятлення, вільготнасці, апрацоўкі міжрадкоўяў. Вылучаюць С. раскідную, радковую, гняздавую і інш. Тэрміны С. залежаць ад с.-г. культуры і раёнаў вырошчвання. Да раслін ранніх тэрмінаў С. належаць яравая пшаніца, ячмень, авёс, лён, цукр. і кармавыя буракі, гарчыца, гарох, шматгадовыя травы, віка; больш позніх тэрмінаў — кукуруза, сорга, проса, грэчка, рыс, соя, бахчавыя і інш. культуры, насенне якіх прарастае пры больш высокай т-ры ці ўсходы гінуць ад веснавых замаразкаў. Глыбіня загортвання залежыць ад біял. патрабаванняў насення да ўмоў прарастання, мех. складу і вільготнасці глебы. Буйное насенне загортваюць глыбей (кукурузу да 10—12 см), чым дробнае (тытунь і шматгадовыя травы на 0,5—2 см). На гліністы х глебах насенне загортваюць на меншую глыбіню, чым на пясчаных і супясчаных. Ад норме высеву залежаць плошча жыўлення раслін, іх кусцістасць, галінастасць, аблісцеласць, ураджайнасць і якасць прадукцыі. Норма высеву залежыць ад біял. асаблівасцей культуры, ступені акультуранасці і ўзроўню ўрадлівасці глебы, вільготнасці яе верхняга слоя, тэрміну С., папярэдніх культур і інш.

СЯЎКІ, вёска ў Лоеўскім р-не Гомельскай вобл., на р. Песачанка. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 35 км на ПдЗ ад г.п. Лоеў, 121 км ад Гомеля, 50 км ад чыг. ст. Хойнікі. 336 ж., 119 двароў (2002). Базавая школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

СЯЎКО́ Баляслаў Іванавіч (15.5.1940, в. Межырэчы Зэльвенскага р-на Гродзенскай вобл. —2.6.2002), бел. акцёр. Засл. арт. Беларусі (1976). Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1965). З 1965 акцёр Нац. акад. т-ра імя Я.Коласа. Выканаўца драм. і характарных роляў, якія вылучаліся псіхал. дакладнасцю, эмацыянальнай насычанасцю вобразаў, пластычнасцю і экспрэсіяй: Юрка, Валодзька, Сын («Таблетку пад язык» А.Макаёнка), Сярожа, дзядзька Шура [«Скорыя цягнікі», «Таму што люблю» («Дзень карабля») А.Паповай], Чорт («Блудны муж і яго жонка Варвара» паводле Г.Марчука), Фатограф («Шагал... Шагал...» У.Драздова), Алёша («Прыніжаныя і зняважаныя» паводле Ф.Дастаеўскага), Аўгуст Фіш («Аз і Ферт» П.Фёдарава), Колесаў («Развітанне ў чэрвені» А.Вампілава), граф фон Моар [«Я, ты, ён, яна, яны... яно» («Разбойнікі») Ф.Шылера], Сільвіо («Слуга двух гаспадароў» К.Гальдоні), Фрыц, Наведвальнік («Пісьменныя» паводле М.Чокэ) і інш. Здымаўся ў кіно. Арганізатар і кіраўнік (з 1969) Віцебскага нар. т-ра пантамімы «Мім».



Сяўруга.

СЯЎРУ́ГА (Acipenser stellatus), рыба сям. асятровых атр. асетрападобных. Пашырана ў бас. Чорнага, Азоўскага і Каспійскага мораў. Прахадная.

Даўж. да 2,2 м, маса да 80 кг. Цела ўкрыта 5 радамі вял. касцявых пласцінак (жучак), паміж якімі па баках — зорчатыя пласцінкі. Рыла выцягнутае, мечападобнае. Ніжняя губа перарваная. Вусікі не маюць махроў. Ёсць яравыя і азімыя формы. Нерастуе ў рэках, нагульваецца ў моры. Корміцца воднымі беспазваночнымі і дробнай рыбай. Атрыманы гібрыды С. з асятром, сцерлядзю і шыпам. Аб'ект промыслу і развядзення.

СЯЎРУ́К Людвіг Сцяпанавіч (1807, в. Сялец Брагінскага р-на Гомельскай вобл. — 3.7.1851), бел. і расійскі вучоны ў галіне анатоміі. Д-р медыцыны (1838), праф. (1840). Скончыў Віленскі ун-т (1832). З 1834 выкладаў у Віленскай медыка-хірург. акадэміі, з 1840 у Маскоўскім ун-це. Навук. працы па паталаг. анатоміі, даследаванні халеры, уплыве маслянай к-ты на жывёльны арганізм.

СЯЎРУ́К Пётр Якаўлевіч (1905, г. Скідзель Гродзенскага р-на — 4.10.1929), бел. паэт. У час. 1-й сусв. вайны жыў з бацькамі ў Тамбоўскай губ. З 1921 на радзіме. Удзельнічаў у рабоце Т-ва бел. школы, Бел. сялянска-работніцкай грамады. Неаднойчы быў арыштаваны польск. ўладамі. Паводле сцвярджання У.Калесніка, у сярэдзіне 1920-х г. друкаваў допісы, вершы, фельетоны ў віленскіх газетах пад псеўд. Плебей. У вершах любоў да роднага краю, прац. чалавека, імкненне да сац. справядлі-

васці, нараканні на цяжкую долю. Быў пад уплывам паэзіі М.Багдановіча. Яго вершы надрукаваны ў час. «Полымя» (1986. № 10).

Літ.: Калеснік У. Час і песні. Мн., 1962. С. 62.



Сячкарня барабанная: 1 — кола ручнога прывода; 2 — камера барабана з рэжучымі нажамі; 3 — рэдуктар; 4 — сілкавальны валец; 5 — прыёмны латак.

СЯХНО́ВІЦКІ КРУХМА́ЛЬНЫ ЗАВО́Д. Дзейнічаў у 1903—20-я г. ў в. Сяхновічы Кобрынскага пав. (цяпер в. Вял. Сяхновічы ў Жабінкаўскім р-не Брэсцкай вобл.). У 1908—10 меў паравы лакамабіль. У 1913 працавала 12 рабочых, выраблена 25 тыс. пудоў крухмалу. Пры заводзе была сыраварня. Сыравіна пастаўлялася з маёнтка памешчыка.

СЯЧКА́РНЯ, сельскагаспадарчая машына для рэзкі саломы на корм, а таксама для здрабнення зялёнай масы раслін на сілас. Бываюць з конным і ручным прыводам (уласна С.), а таксама маторныя — з прыводам ад эл. рухавіка або трактара (*саломасіласарэзкі, здрабняльнікі кармоў*). Ручныя і конныя С. былі пашыраны ў індывід. і калектыўных гаспадарках да сярэдзіны 20 ст.

СЯЧЭ́ННЕ рассеяння ў квантавай механіцы, фізічная велічыня, што характарызуе імавернасць пераходу сістэмы дзвюх сутыкняльных часціц у пэўны канечны стан у выніку пругкага ці няпругкага рассеяння, напр., пучка часціц на нерухомай мішэні. Выражаецца формулай: $d\sigma = dN/nv$, дзе dN — лік такіх пераходаў за адзінку часу: n — канцэнтрацыя часціц, якія падаюць на мішэнь, v — іх скорасць.

У прасцейшым выпадку вызначае памеры плошчы, пры праходжанні праз якую часціца рассейваецца (гл. *Рассеянне мікрачасціц*). Пругкае рассеянне часціц характарызуюць дыферэнцыяльным С. $d\sigma/d\Omega$, дзе $d\Omega$ — элемент цялеснага вугла, у які рассейваюцца часціцы, і поўным пруткім С. σ, роўным інтэгралу дыферэнцыяльнага С., узятаму па поўным цялесным вугле. У фізіцы элементарных часціц эфектыўнае С. (С. рэакцыі) характарызуе працэсы іх узаемадзеяння (рассеянне, распад, анігіляцыю, мнаствавае нараджэнне часціц і інш.). Эксперыментальныя вымярэнні С. даюць звесткі аб структуры сутыкняльных часціц. Напр., вымярэнні пругкага рассеяння альфа-часціц атамамі рэчыва дазволілі адкрыць атамнае ядро, а пругкага рассеяння электронаў нуклонамі — вызначыць радыусы нуклонаў і размеркаванне ў іх эл. зараду і магн. моманту (эл.-магн. формфактар). Паняццем С. карыстаюцца таксама ў кінетычных ураўненнях, што апісваюць нераўнаважныя працэсы ў статыст. фізіцы і фіз. кінетыцы.

А.А.Богуш.

Т

Т, дваццатая літара бел. алфавіта. Паходзіць з кірыліцкай Т («тверда»), утворанай на аснове грэка-візант. устаўнай Т. («тау»).

У старабел. графіцы ў сувязі з функцыянаваннем розных пісьмовых школ і выкарыстаннем розных тыпаў пісьма (*устаў, паўустаў, скорапіс*) ужывалася ў некалькіх варыянтах, якія памагаюць вызначаць час і месца напісання помнікаў. Абазначала гукі «т», «ц'» («т'»): «трава», «путь», «тихий». Мела лічбавае значэнне «трыста». У 16 ст. акрамя рукапіснай набыла друкаваную форму.

У сучаснай бел. мове абазначае шумны глухі цвёрды пярэднеязычны зычны гук «т» («мята» — «м'ата»; «твар»), перад галоснымі «е», «ё», «і», «ю», «я», мяккім «в» і «ь» у адпаведнасці з вымаўленнем замяняецца літарай «ц» («брат — брацік», «кут — у куце», «чатыры — чацвёрты»). Бывае вялікая і малая, мае рукапісную і друкаваную форму. *А.М.Булыка.*

ТАБА́ГА (Tobago), востраў у Атлантычным ак., у складзе дзяржавы *Трынідад і Табага*. Пл. 300 км^2. Нас. каля 40 тыс. чал. (2000). На ПнУ горы (выш. да 579 м), складзеныя з вулканагенных парод, на ПдЗ нізіннае вапняковае плато. Клімат субэкватарыяльны, гарачы і вільготны. Вечназялёныя лясы. Гал. горад — Скарбара. Адкрыты Х.*Калумбам* у 1498.

ТАБАКО́Ў Алег Паўлавіч (н. 17.8.1935, г. Саратаў, Расія), расійскі акцёр, рэжысёр, педагог, тэатр. дзеяч. Нар. арт. Расіі (1977). Нар. арт. СССР (1988). Скончыў Школу-студыю Маскоўскага Маст. акад. т-ра (МХАТ, 1957). З 1957 у Маскоўскім т-ры «Сучаснік», з 1983 у МХАТ, з 1989 у МХАТ імя А.Чэхава, з 2000 маст. кіраўнік. У 1974 арганізаваў у Маскве тэатр. студыю (з 1992 Маскоўскі т-р пад кіраўніцтвам А.Табакова). У 1989—2000 рэктар Школы-студыі пры МХАТ (з 1989 праф.). Акцёр яркага артыстызму і шырокага творчага дыяпазону. Валодае ўсімі адценнямі камед. ігры, часам звяртаецца да шаржу: Алег («У пошуках радасці» В.Розава), Аляксандр Адуеў («Звычайная гісторыя» паводле І.Ганчарова), Балалайкін («Балалайкін і К°» паводле М.Салтыкова-Шчадрына), Ён («Лаўка» А.Гельмана) і інш. Сярод пастановак: «Білоксі-блюз»



А.П.**Табакоў**.

Н.Саймана (1987), «Матроская цішыня (Малая вялікая зямля)» А.Галіча (1990), «Механічнае піяніна» А.Адабаш'яна і М.Міхалкова (1993), «Чэмпіёны» Дж.Мілера (1996), «На ўсякага мудраца хапае прастаты» А.Астроўскага (1997) і інш. Здымаецца ў кіно: «Шумны дзень», «Жывыя і мёртвыя», «Вайна і мір», «Гары, гары, мая зорка», «Сямнаццаць імгненняў вясны», «Некалькі дзён з жыцця І.І.Абломава», «Палёты ў сне і наяве», «Сірата казанская», «Шырлі-мырлі» і інш. Дзярж. прэмія СССР 1967. Дзярж. прэмія Расіі 1998.

ТА́БАР (чэш. tabor), 1) у чэхаў, палякаў, румынаў, венграў — лагер, абоз. 2) У казакоў у мінулым — вайсковы лагер з абозам. 3) Група вандроўных цыганоў, частка якой звязана сваяцтвам.

ТА́БАР (Та́бор), горад у цэнтр. ч. Чэхіі, на р. Лужніцы. Каля 50 тыс. ж. (2001). Чыг. ст., вузел аўтадарог. Прам-сць: станкабуд., эл.-тэхн., швейная, харчовая.

Засн. ў 1420 паўстаўшымі сялянамі і плебеямі як ваен. лагер, паліт. і ваен. цэнтр *табарытаў* у час *гусіцкіх войнаў*. Названы ў гонар біблейскай гары Фавор, дзе адбылося Праабражэнне Ісуса Хрыста (Т. — чэш. варыянт гэтай назвы). У 1430-я г. ператварыўся ў гандл.-рамесны цэнтр. У 1436 бюргерства заключыла з імператарам Сігізмундам І дагавор, паводле якога Т. атрымаў правы каралеўскага горада. У 1452 захоплены чэш. каралём Іржы Подзебрадам.

Арх. помнікі часоў гусіцкага руху. Помнікі *Я.Гусу* і *Я.Жыжку*. Рэшткі замка (Круглая вежа, 13 ст.). Познагатычная ратуша з гербам горада 1515 з выявай Гуса (зараз музей; 15—17 ст.) і касцёл Праабражэння (15—17 ст.). Шматлікія дамы і скляпы 15—16 ст. з падземнымі пераходамі пад цэнтр. плошчай.

ТАБАРАВЕ́ЦВячаслаў Васілевіч (н. 27.7.1949, в. Відзібор Столінскага р-на Брэсцкай вобл.), бел. вучоны ў галіне кібернетыкі і інфарматыкі. Канд. тэхн. н. (1980), дац. (1982). Скончыў Мінскі радыётэхн. ін-т (1973), дзе працаваў да 1994. У 1987—91 праф. Дар-эс-Саламскага каледжа (Танзанія). З 1994 прарэктар Мінскага ін-та кіравання. Навук. працы па тэорыі аўтам. кіравання і інфарм. тэхналогіях, метадах аўтаматызаванага праектавання.

Тв.: Автоматизация исследований динамических систем. Мн., 1978 (разам з Г.В.Рымскім); Аналитическое преобразование на ЭВМ структур систем управления. Ч. 1—2. Мн., 1988—89 (разам з Г.В.Рымскім, І.П.Стацук).

М.П.Савік.

ТАБАРЫ́ТЫ, радыкальна настроеныя ўдзельнікі *гусіцкіх войнаў* у сярэдневяковай Чэхіі, апаненты памяркоўных гусітаў-чашнікаў. Летам 1419 каля 42 тыс. сялян і гар. беднякоў заснавалі ў Паўд. Чэхіі на гары *Табар* (адсюль назва) умацаваны лагер (пазней ператварыўся ў горад), які стаў цэнтрам іх руху. Аб'ядноўвалі таксама рамеснікаў, ніжэйшае духавенства, частку дробнай шляхты. У Табары і інш. гарадах і паселішчах утваралі абшчыны-камуны, выбіралі ўласных біскупа, ваен. кіраўнікоў (гетманаў); прапагандавалі ідэю «боскага царства» ўсеагульнай роўнасці і сац. справядлівасці ў грамадстве, адмаўлялі несправядлівыя парадкі, пышны каталіцкі культ. Былі асн. сілай гусіцкага руху, стварылі палявое войска, якое пад камандаваннем палкаводцаў Мікулаша з Гусі (да 1420), *Я.Жыжкі* (да 1424), Пракопа Вялікага (да 1434) адбіла 5 крыжовых паходаў (1420, 1421, 1426, 1427, 1431), накіраваных супраць іх, у 1428—33 здзейсніла некалькі паспяховых паходаў у суседнія краіны. Але ў выніку ўнутр. расколу пацярпелі паражэнне ад аб'яднаных сіл чашнікаў і іх саюзнікаў (май 1434). Канчаткова разбіты ў 1437.

ТА́БЕЛЬ (ням. Tabelle ад лац. tabell дошчачка), 1) спіс для ўліку чаго-н. у пэўным парадку. Напр., Т.-каляндар змяшчае распісаныя па графах дні года. 2) Ведамасць паспяховасці школьнікаў.

ТА́БЕЛЬ АБ РА́НГАХ, заканадаўчы акт Рас. імперыі, які ў 18 — пач. 20 ст. вызначаў падзел на класы ваен., стацкіх і прыдворных чыноў. Уведзены Пятром I у 1722. Складаўся з уласна Табеля з пералікам 14 рангаў (класаў) ад 1-га вышэйшага да 14-га ніжэйшага і з 19 пунктаў каментарыяў да яго. Вайск. чыны падзяляліся на сухап., гвардыю, артыл., марскія. Сярод іх адрозніваліся генеральскія чыны (1—5-ы кл.), штаб-афіцэрскія (6—8-ы кл.), обер-афіцэрскія (9—14-ы кл.). Пры роўным чыне старшынства вызначалася часам атрымання чыну. Вайск. чыны мелі старшынства перад цывільнымі адпаведнага рангу. Чыны гвардыі мелі перавагу на 1—2 рангі. Паводле 1-й рэд. Табеля, атрыманне чыноў 7—14-га рангаў давала пэўныя правы цывільным чыноўнікам на час выканання службовых абавязкаў (пазней асабістае дваранства), спадчыннае дваранства атрымлівалі вайскоўцы ад 14-га і цывільныя асобы ад 8-га кл. З 1845 асабістае дваранства атрымлівалі чыны ад 9-га кл., спадчыннае дваранства — вайск. чыны ад 6-га і цывільныя ад 5-га (з 1856 — 4-га) кл. Недваране для атрымання афіцэрскага чыну служылі 12 гадоў у унтэр-афіцэрскіх чынах. Асобы, што былі ў чынах, якія не давалі асабістага дваранства, з 1832 маглі набываць правы ганаровых грамадзян. У пазнейшых рэдакцыях у Табель унесены горныя чыны і вучоныя ступені. Сістэма старшынства Табеля ахоплівала і чл. сямей чыноўнікаў: дочкі атрымлівалі ранг ніжэйшы на 4 рангі ад бацькавага, пасля выхаду замуж — ранг мужа. Чыны 1—2-га кл. тытулаваліся «высокаправасхадзіцельства», 3—4-га кл. — «правасхадзіцельства», 5-га — «высакароддзе», 6—8-га — «высокаблагароддзе», 9—14-га — «благароддзе». Правы на пэўныя ступені ордэнаў мелі чыны адпаведных класаў, а ўзнагарода ордэнам «вышэйшага» класа аўтаматычна азначала пераход у гэты клас. У 1801—41 друкаваліся спісы ўсіх цывільных чыноў, у 1842—1916 — цывільных чыноў першых 4 кл.; выдаваліся спісы генералаў, штаб і обер-афіцэраў паводле старшынства. У 18—19 ст. Табель неаднаразова мадэрнізаваўся. Тытуляванне ў арміі адменена загадам ваен. міністра Часовага ўрада 5(18).3.1917, ваен.-прыдворныя чыны скасаваны загадам 21.3(3.4).1917. Палажэнні Т.а.р. адменены дэкрэтам ВЦВК і СНК 10(23).11.1917 «Аб скасаванні саслоўяў і грамадзянскіх чыноў», інш. дакументамі сав. улады ў снеж. 1917 — студз. 1918.

Літ.: Шепелев Л.Е. Отмененные историей чины, звания и титулы в Российской империи. Л., 1977. *І.І.Сінчук.*

ТАБЕРНА́КЛЬ (ад лац. tabernaculum шацёр), 1) у гатычнай культавай архітэктуры ніша ў алтарнай сцяне для размяшчэння культавых атрыбутаў (звычайна аформлена невял. накладным порцікам). Часам Т. наз. вежападобную адкрытую прыбудову да алтара для размяшчэння статуй святых. 2) Невял. шафка ў цэнтры касцельнага алтара на яго подыуме. Прызначаецца для захоўвання прадметаў рэліг. пакланення. Яе робяць звычайна з дрэва, аздабляюць у сярэдзіне белым шоўкам або фарбуюць у белы колер, звонку ўпрыгожваюць накладной драўлянай паліхромнай ці пазалочанай разьбой [Домік для Сакраманту ў касцёле св. Лаўрэнція ў г. Нюрнберг, Германія, 1493—96, аўтар А.Крафт; Т. у інтэр'еры касцёла Дзевы Марыі (Марыяцкага) у г. Кракаў, Польшча, 1552, аўтар Дж.М.Падавана]. У раннім сярэдневякоўі Т. умуроўвалі ў алтарную сцяну, у перыяд барока і ракако — самаст. элемент алтара (касцёл францысканцаў у Гродне, фарны касцёл у г. Ліда).



Табернакль (злева) у інтэр'еры касцёла Дзевы Марыі (Марыяцкага) у г. Кракаў (Польшча).

ТАБЕ́Т Антуан Жорж (13.6.1907, г. Бхамдун, Ліван — 16.5.1964), ліванскі архітэктар, грамадскі дзеяч, публіцыст. Скончыў вышэйшую інж. школу ў Бейруце (1927), АМ у Парыжы, дзе вучыўся ў А.*Перэ*. У сваіх пабудовах Т. кіраваўся прынцыпамі сучаснай еўрап. архітэктуры, увасабляў іх з улікам кліматычных умоў Лівана: «Каледж мудрасці» (1938), група жылых дамоў у раёне Хазміі (1960) у Бейруце і інш. У 1949 старшыня Ліванскага савета міру, з 1950 чл. Прэзідыума Сусв. Савета Міру. Міжнар. Ленінская прэмія «За ўмацаванне міру паміж народамі» 1961.

Літ.: Табет М., Табет Ж. Антуан Табет: Пер. с фр. М., 1968.

ТАБІ́ДЗЕ Галакціён Васілевіч (18.11.1892, с. Чквіісі, Грузія — 17.3.1959), грузінскі паэт. Нар. паэт Грузіі (1933). Акад. АН Грузіі (1944). Вучыўся ў Тыфліскай духоўнай семінарыі (1908—10). Друкаваўся з 1908. У зб. вершаў «Артыстычныя кветкі» (1919) адчувальны ўплыў сімвалізму. Аўтар паэм «Джон Рыд» (1924), «Эпоха» (1930), «Акакій Цэрэтэлі» (1940), зб-каў вершаў «Радзіма — жыццё маё» (1943), «Сто вершаў» (1959), паэт. трактата «Гутарка пра лірыку» (1940). На бел. мову яго асобныя вершы пераклалі У.Карызна, В.Сёмуха.

Тв.: Бел. пер. — у кн.: Анталогія грузінскай паэзіі. Мн., 1989. Т. 2; Рус. пер. — Полвека: Стихи и поэмы. Тбилиси, 1959; Стихотворения. Л., 1983.

Літ.: Маргвелашвили Г. Г.Табидзе. Тбилиси, 1973.

ТАБІ́ДЗЕ Тыцыян Юстынавіч (2.4.1895, с. Шуамта Ванскага р-на, Грузія — 16.12.1937), грузінскі паэт. Скончыў Маскоўскі ун-т (1917). Друкаваўся з 1912. Адзін з заснавальнікаў групы груз. сімвалістаў «Блакітныя рогі» (1915). Пазней пазбавіўся ўплыву сімвалізму. Роздумам пра жыццё адзначаны яго вершы «Радзіма», «Тбіліская ноч». Аўтар паэм «Руаль Амундсен», «Рыён-Порт», «На франтах», «1918 год» (усе 1928), зб-каў «Вершы» (1933), нарысаў «Сэрцам да сэрца» (1934). На бел. мову асобныя вершы перакладаў М. Лужанін.

Тв.: Бел. пер. — у кн.: Анталогія грузінскай паэзіі. Мн., 1989. Т. 2; Рус. пер. — Стихотворения и поэмы. М.; Л., 1964.

Літ.: Цурикова Г. Т.Табидзе. Л., 1971.

Табліца

Некаторыя чыны паводле Табеля аб рангах (па стане на 1917)

Клас	Армейскія сухапутныя чыны	Стацкія чыны
1	Генерал-фельдмаршал	Канцлер
2	Генерал	Правадзейны тайны саветнік
3	Генерал-лейтэнант	Тайны саветнік
4	Генерал-маёр	Правадзейны стацкі саветнік
5	—	Стацкі саветнік
6	Палкоўнік	Калежскі саветнік
7	Падпалкоўнік	Надворны саветнік
8	Капітан	Калежскі асэсар
9	Штабс-капітан	Тытулярны саветнік
10	Паручнік	Калежскі сакратар
11	—	Карабельны сакратар
12	Падпаручнік	Губернскі сакратар
13	Прапаршчык	Правінцыяльны сакратар
14	—	Калежскі рэгістратар

ТАБЛІ́ЦА (польск. tablica ад лац. tabula дошка), пералік звестак, лічбавых даных, прыведзеных у пэўную сістэму і разнесеных па графах (клетках). Клеткі ўтвораны ад перасячэння гарыз. радкоў і верт. калонак, у іх размешчаны лічбавыя даныя, змест якіх раскрываецца загалоўкам суадноснага радка, напр., *табліцы матэматычныя*.



Г.В.**Табідзе**.

ТАБЛІ́ЦЫ МАТЭМАТЫ́ЧНЫЯ, сукупнасць значэнняў пэўнай функцыі для некаторых значэнняў яе аргументаў. Асн. характарыстыкі: ступень дакладнасці (4, 5 і больш знакаў у значэннях функцыі), дыяпазон значэнняў аргументаў і крок (рознасць паміж суседнімі значэннямі аргументаў). Для прамежкавых значэнняў аргументаў значэнні функцый знаходзяць з дапамогай *інтэрпаляцыі і экстрапаляцыі* (лінейнай ці квадратычнай). Выкарыстоўваюцца як дапаможны выліч. сродак пры разліках у матэматыцы, астраноміі, тэхніцы і інш.

Некаторыя Т.м. (табліцы здабыткаў натуральных лікаў, іх квадратаў, кубаў і інш.) з'явіліся ў Вавілоне за 2 тыс. г. да н.э. Першыя табліцы трыганаметрычных функцый складзены ў Стараж. Грэцыі *Пталамеем* (2 ст.), дзе прыведзены даўжыні хордаў, што адпавядаюць дугам ад 0 да 180° з крокам 30′. Вядомыя таксама табліцы трыганаметрычных функцый, складзеныя у 5—11 ст. арабскімі, сярэднеазіяцкімі і індыйскімі вучонымі. У Еўропе Т.м. пачалі з'яўляцца ў 15 ст. У 7-значных табліцах *Рэгіямантана*, дзе выкарыстоўвалася дзесятковая сістэма лічэння, праведзены значэнні сінуса з крокам 1′. Вылічвалі і выдавалі Т.м. таксама М.*Капернік* (1543), І.*Кеплер* (1604), І.*Ньютан* (1658) і інш. Табліцы натуральных лагарыфмаў вылічаны Дж.*Неперам* (1614) і блізкія да іх табліцы — І.Бюргі (1620); табліцы дзесятковых лагарыфмаў — Г.*Брыгсам* (1617). У 18—19 ст. з'явіліся табліцы спец. функцый: дзесятковых лагарыфмаў гама-функцыі (К.Ф.*Гаўс*; 1813), дзесятковых лагарыфмаў поўных эліптычных інтэгралаў (А.М.*Лежандр*; 1816), цыліндрычных функцый (Ф.В.*Бесель*; 1826, Э.Ломель; 1868) і інш. З развіццём выліч. тэхнікі ў 20 ст. пачалі вылічваць і выпускаць у асн. высокадакладныя (да 30 і больш знакаў) табліцы спец. і інш. класаў функцый, аднак пры гэтым значэнне Т.м. значна зменшылася. Існуюць таксама Т.м. інтэгралаў, функцый, ураўненняў і інш. матэм. аб'ектаў.

Літ.: Крылов В.И., Лугин В.В., Янович Л.А. Таблицы для численного интегрирования функций со степенными особенностями... Мн., 1963; Брадис В.М. Четырехзначные математические таблицы. 44 изд. М., 1973; Градштейн И.С., Рыжик И.М. Таблицы интегралов, сумм и произведений. М., 1962. *Л.А.Яновіч.*

ТАБЛО́ (франц. tableau літар. — карціна), шчыт са светлавымі сігналамі, надпісамі, якія перадаюць пэўную інфармацыю. Ужываецца ў дыспетчарскай службе, на стадыёнах і спарт. пляцоўках (для аб'яўлення вынікаў спаборніцтваў), у рэкламнай, канцэртнай і інш. дзейнасці.

ТА́БМЕН (Tubman) Гарыет (каля 1820, Бактаўн, ЗША — 10.3.1913), гераіня негрыцянскага народа, змагар за ліквідацыю рабства ў ЗША. Нарадзілася ў сям'і раба. Каля 1849 збегла ад рабаўладальніка, далучылася да абаліцыяністкага руху (гл. *Абаліцыянізм*). Асабіста дапамагла вызваліцца з рабства больш за 300 чал. У *грамадзянскую вайну ў ЗША 1861—65* у арміі Поўначы: мед. сястра, разведчыца; арганізавала партыз. брыгаду, якая дзейнічала ў паўд. штатах. Пасля вайны змагалася супраць расавай дыскрымінацыі і прыгнятання неграў, выступала ў абарону правоў жанчын.



М.**Таболіч**. Ноч. 1998.

ТАБО́ГАН, сані без палазоў у індзейцаў Паўн. Амерыкі. Уяўлялі сабой некалькі дошак, змацаваных папярочкамі і рамянямі, з загнутым перадком; па баках нацягнута шкура або бяроста. Перасоўваліся ўручную або з дапамогай сабак. Як від спорту вядомы з пач. 20 ст.

ТАБО́Л, рака ў Казахстане і Расіі, левы прыток р. Іртыш (бас. р. Об). Даўж. 1591 км, пл. бас. 426 тыс. км^2. Верхняе цячэнне па Тургайскім плато, сярэдняе і ніжняе па Зах.-Сібірскай раўніне. Асн. прытокі: Ісець, Тура, Таўда (злева), Убаган (справа). У нізоўях ледастаў з кастр.—ліст., у вярхоўях — з ліст. да сярэдзіны мая. Разводдзе ў вярхоўях з 1-й пал. крас. да сярэдзіны чэрв., у нізоўях — да пач. жніўня. Сярэдні расход вады каля с. Ліпаўскае 838 м^3/с. Рэгулярнае суднаходства ў вярхоўях (105 км) і ад вусця р. Тура (255 км). Сплаўная. На Т. — гарады Лісакоўск, Рудны, Кустанай (Казахстан), Курган, Ялутараўск (Расія).

ТАБО́ЛІЧ Марыя Яўгенаўна (н. 1.5.1957, в. Тартак Быхаўскага р-на Магілёўскай вобл.), бел. мастак. Жонка Р.Ф.*Таболіча*. Скончыла Бел. тэатр.-маст. ін-т (1981). З 1981 у вытв. майстэрнях Бел. саюза мастакоў у Магілёве, у 1995—97 заг. маст. аддзялення Магілёўскага вучылішча культуры, у 2000—02 дырэктар прыватнай маст. галерэі. Працуе ў галіне станковага жывапісу. Аўтар тэматычных карцін «Адпачынак» (1980), «Свята» (1981), «Нашчадкі» (1982), «Ліхалецце», «Мацярынства» (абедзве 1984), «Вёсны маёй Радзімы» (1985), «У нядзелю» (1989), «Вобразы. Прысвячаецца М.Багдановічу» (1991), «Магілёўскія друкары Вашчанкі» (1992), «Песня» (1997), нацюрмортаў з ручніком (1989), з васількамі (1990), з сухімі кветкамі (1993), з рыбай (1994). Сярод інш. твораў: «Наталля» (1996), «Кампазіцыя» (1997), «Ноч», «Лёсы» (абодва 1998). Творчасць адметная лірызмам, мажорнасцю колеравага вырашэння, пошукам новых сродкаў выразнасці.

ТАБО́ЛІЧ Рыгор Фядосавіч (н. 13.3.1956, в. Палосцевічы Жыткавіцкага р-на Гомельскай вобл.), бел. мастак. Муж М.Я.*Таболіч*. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1981). У 1990—98 выкладаў у Магілёўскім вучылішчы культуры, у 2000 адкрыў першую прыватную маст. галерэю ў Магілёве. Працуе ў галіне станковага жывапісу. Творы вылучаюцца кампазіцыйнай завершанасцю, філас. асэнсаваннем рэчаіснасці, фактурнай лепкай вобразаў з яскрава выражаным колеравым акцэнтаваннем: «Спадчына» (1979), «Гаспадар», «Стары калодзеж», «Маці паэта» (усе 1981), «Вянок Максіма» (1982), «Вогненная вёска» (1984), «З глыбінь вякоў», «Стыхія» (абодва 1985), «Плынь» (1991), «Іван Фёдараў і Пётр Мсціславец» (1992), «Святая крыніца» (1994), «Зніч» (1995), «Адлюстраванні» (1996), «Радзіма паэта. Прысвячаецца А.Міцкевічу» (1998), «Рух» (1999), «Сустрэча» (2000). Аўтар дыпціха «Вогненная вёска» (1984), трыпціха «Русь Белая, Чырвоная, Чорная» (1995), цыклаў «Колеры» (1991), «Мелодыі» (1994).

ТАБО́ЛЬСК, горад у Цюменскай вобл. Расіі, порт на р. Іртыш, каля ўпадзення ў яе р. Табол. 97 тыс. ж. (1999). Чыг. станцыя. Аэрапорт. Прам-сць: дрэваапр., лёгкая, харчовая; нафтахім. і ёда-

вы камбінаты; суднаверф, суднарамонтны з-д; прадпрыемствы: мэблевая, дыванаткацкая ф-кі, маст. разьбы па косці, па вытв-сці буд. матэрыялаў. Пед. ін-т, філіял Казанскага тэхнал. ун-та. Драм. тэатр (з 1705). Гіст.-арх. музей-запаведнік (з 1870).

Засн. ў 1587 атрадам казакоў Д.Чулкова. Да 1590 адміністрацыйна падпарадкаваны г. Цюмень. У 1606—09 пабудаваны драўляны горад, які поўнасцю знішчаны пажарамі 1643, 1677, 1680. У 17—18 ст. Т. — гал. ваенна-адм., паліт., культ. (тут пісаліся летапісы, адкрыты першыя ў Сібіры школы, тэатр, друкарня, выдаваўся час. «Иртыш, превращающийся в Ипокрену») і царк. (у 1620 створана Сібірская епархія, у далейшым — Табольская мітраполія) цэнтр Сібіры. З 1708 горад, цэнтр Сібірскай губ., з 1782 — Табольскага намесніцтва, у 1796—1917 — Табольскай губ. Горад меў гандл. сувязі з Бухарой, Джунгарыяй, Кітаем. У 1773—74 апорны пункт урада пры задушэнні сял. вайны пад кіраўніцтвам Е.І.*Пугачова*. Месца паліт. ссылкі, у т.л. *Авакума*, П.С. і М.С. Бабрышчавых-Пушкіных, А.М.*Радзішчава*, В.К.*Кюхельбекера*, М.М.*Мураўёва*, М.А.*Фанвізіна* і інш. У канцы 19 ст. эканам. значэнне Т. паменшала. У жн. 1917 — крас. 1918 тут пад арыштам знаходзіўся апошні рас. імператар *Мікалай II* з сям'ёй.

Напачатку ў Т. пераважала драўляная забудова. З канца 17 ст. пачалося мураванае будаўніцтва: у нагорнай яго частцы ўзведзены першы ў Сібіры мураваны крэмль (17 — пач. 18 ст.), Сафійска-Успенскі (1681—86) і Пакроўскі (1743—46) саборы. Захаваліся комплекс Гасцінага двара (1703—05), «Шведская палата» (1714—16); Святыя вароты (1748), цэрквы Спаская (1709—13), Андрэеўская (1744—59), Раства Багародзіцы (1744—61), Міхаіла Архангела (1745—54), Крыжаўзвіжанская (1754—71), Захарыя і Лізаветы (1759—76), Параскевы Пятніцы (1762), Пятра і Паўла (1768—88), жылыя і адм. будынкі ў стылі барока, класіцызму, эклектыкі і мадэрна. Помнік Ермаку (1839).

З Т. звязаны лёс многіх беларусаў, якія траплялі сюды пераважна прымусова ў выніку рус.-польскіх войнаў 17 ст. Яны адыгралі



Да арт. **Табольск**. Сафійска-Успенскі сабор. 17 ст.

вял. ролю ў культ. развіцці Т., адрозніваліся больш высокай пісьменнасцю. Адзін з папалечнікаў Ермака полацкі шляхціц Корсак на мяжы 17 ст. склаў т.зв. Пагодзінскі спіс Есіпаўскага летапісу. Барысаўскі шляхціц С.Станкевіч, сасланы ў Т. у 1659, склаў летапіс «Сібірская гісторыя» задоўга да летапісу С.У.*Рэмезава*, якога лічаць першым гісторыкам Сібіры. Беларус І.Даніловіч быў у 1673 табольскім стралецкім галавой. У 18 ст. царскі ўрад працягваў выкарыстоўваць ваеннапалонных з ВКЛ з мэтай фарміравання ў Т. казацкіх атрадаў для Сібірскіх і Калыванскіх ліній. Праз перасыльную турму ў Т. ў 19 ст. прайшлі ссыльныя дзекабрысты, у т.л. ўраджэнцы Беларусі, на катаргу і пасяленне ў Сібір з Беларусі адпраўлена 12 483 удзельнікі паўстання 1863—64. Доўгі час у Т. жылі сасланыя А.*Петрашкевіч*, удзельнікі паўстання 1863—64 К.Кастравіцкі (у 1868 у яго нарадзіўся тут сын, вядомы бел. паэт К.*Каганец*), Я.Ф.*Ястржэмбскі*, Я.*Дамель* і інш.

Літ.: 400 лет Тобольску: Сб. док. и материалов. Свердловск, 1987; Заварихин С.П. В древнем центре Сибири. М., 1987; Белорусы в Сибири. Новосибирск, 2000; Очерки истории белорусов в Сибири в XIX—XX вв. Новосибирск, 2001.

Г.А.Лаўрэцкі (архітэктура), *В.А.Ярмоленка* (беларусы ў Т.).



Р.**Таболіч**. Русь Белая. З трыпціха «Русь Белая, Чырвоная, Чорная». 1995.

ТАБУ́ (палінезійск.), 1) пашыраная ў першабытным грамадстве сістэма забарон, парушэнне якіх нібыта караецца звышнатуральнымі сіламі. Звычай Т. ўпершыню апісаў у 1771 Дж.*Кук* у абарыгенаў а-воў Тонга (Палінезія); там табуіраваным было ўсё, што адносілася да багоў і духаў, што належала жрацам і правадырам. Т. рэгламентавалі найважнейшыя бакі жыцця чалавека, найперш захаванне шлюбных норм, выкарыстанне пэўных прадметаў, слоў і г. д. Узнікненне Т. відавочна звязана з патрэбамі чалавечага грамадства, якое складвалася, каб падпарадкаваць паводзіны індывідуума інтарэсам калектыву. Перажыткі Т. захоўваюцца і ў сучасных рэлігіях (напр., у хрысціянстве панятце граху аналагічна Т.). 2) У шырокім сэнсе — строгая забарона.

ТАБУЛАТУ́РА (нам. Tabulatur ад лац. tabula дошка, табліца), 1) літарная ці лічбавая сістэма запісу інстр. музыкі ў Еўропе ў 14—18 ст. Гл. ў арт. *Нотнае пісьмо*. 2) Правілы і рэкамендацыі адносна зместу, структуры, а таксама выканання муз.-паэт. твораў *майстэрзінгераў*. Упершыню сістэматызаваны А.Пушманам каля 1600.

Літ.: Барсова И.А. Очерки по истории партитурной нотации (XVI — первая половина XVIII в.). М., 1997. *Н.В.Сазановіч.*

ТАБУЛЯ́ТАР (ад лац. tabula дошка, табліца, запіс), 1) электрамеханічная *вылічальная машына* для аўтам. счытвання даных з перфакарт, вылічэння вынікаў па групавых прыкметах і друкавання іх у выглядзе табліц, тэксту, графікаў і інш. Выкарыстоўвалася на машыналічыльных станцыях для апрацоўкі вынікаў бухгалтарскіх, статыстычных, планавых, уліковых і інш. задач. 2) Прыстасаванне ў *пішучых машынках* для друкавання табліц.

ТАБУЛЯ́ТЫ (Tabulata), падклас вымерлых *каралавых паліпаў*. Жылі ў познім кембрыі — пермі на марскім мелкаводдзі. 2 надатр., каля 160 родаў. На Беларусі знаходкі рэштак вядомы ў адкладах верхняга ардовіку, сілурыйскіх, верхне- і ніжнедэвонскіх і каменнавугальных. Выкарыстоўваюцца для вызначэння ўзросту геал. адкладаў.

Утваралі масіўныя, пласціністыя, пучкападобныя, кусцістыя, сцелістыя, галінастыя калоніі з трубчастых вапняковых каралітаў дыяметрам 1—6 мм, акруглых ці шматвугольных у сячэнні.

ТАБУ́Н, статак коней ці вярблюдаў для ўтрымання на перыяд пасьбы ці круглы год (у гаспадарках табуннай конегадоўлі). У Т. аб'ядноўваюць жывёл аднаго ўзросту і полу, асобна кабыл, жарабцоў-вытворнікаў, маладняк.

ТАБУ́Н, дыметыламід этылавага эфіру цыянафосфарнай кіслаты, атрутнае рэчыва нервова-паралітычнага дзеяння, $(CH_3)_2NP(O)(OC_2H_5)CN$. Выклікае моцны міёз. Лятальная таксічная доза пры інгаляцыі (умоўна) 0,4 мг·мін/л.

Бясколерная лятучая вадкасць, шчыльн. 1077,8 кг/м^3, $t_{кіп}$ 240 °С (кіпіць з раскладаннем). Растваральніках. У водных растворах шчолачаў, аміяку і амінаў хутка раскладаецца (рэакцыі выкарыстоўваюць для дэгазацыі Т.). Сінтэзаваны ў 1936 ням. хімікам Г.Шрадэрам.

ТАБЫ́Н-БО́ГДА-О́ЛА, горны вузел на ПдУ Алтая, на граніцы Расіі, Манголіі, Кітая. Найб. вышыня да 4356 м (г. Найрамдал). Складзены з метамарфічных сланцаў і гранітаў. Пераважае высакагорны рэльеф. У рачных далінах лістоўнічныя лясы, каля падножжа — зараснікі карлікавай бярозы, вышэй — альпійскія лугі, горныя тундры. 36 ледавікоў (агульная пл. 160 км^2).

ТАВА́Р, прадукт працы, выраблены для задавальнення патрэб грамадства шляхам куплі-продажу ці абмену на рынку. Прадукт працы становіцца Т. ва ўмовах грамадскага *падзелу працы* і адасаблення вытворцаў на выраб якога-н. прадукту. Т. мае *вартасць* і *спажывецкую вартасць*. Паводле К.Маркса, 2 бакі Т. абумоўлены дваістым характарам, увасобленай у ім працы. Спажывецкая вартасць утвараецца вызначанай карыснай працай работніка пэўнай спецыяльнасці (канкрэтная праца) і складае рэчавы змест багацця кожнага грамадства. Вартасць утвараецца абстрактнай працай — затратай інтэлектуальнай, нервовай, мускульнай энергіі таваравытворцы наогул, незалежна ад канкрэтнай формы праяўлення. У адпаведнасці з працоўнай тэорыяй вартасці (А.Сміт, Д.Рыкарда, К.Маркс) спажывецкая вартасць з'яўляецца носьбітам вартасці, але паміж імі існуе ўнутр. супярэчнасць. Як спажывецкія вартасці розныя Т. якасна разнародныя і колькасна несувымерныя, як вартасці — аднародныя. Гэтая агульная ўласцівасць (арэчаўленая грамадская праца) дае магчымасць прыраўноўваць Т. адзін да аднаго і абменьваць яго ў адпаведных прапорцыях (гл. *Менавая вартасць*). Прадстаўнікі *граничнай карыснасці тэорыі* (К.Менгер, О.Бём-Баверк, Ф.Візэр і інш.) у сваіх даследаваннях найперш вылучаюць ролю карыснасці Т. пры абмене, паводзіны чалавека на рынку. Яны лічаць, што ў аснове абмену знаходзіцца не вартасць, а карыснасць Т., якая і вызначае велічыню яго каштоўнасці. Узровень карыснасці Т. знаходзіцца ў адваротнай залежнасці ад яго колькасці.

А.Л.Падгайскі.

ТАВАРААБАРО́Т, рух *тавараў* у сферы абарачэння ад вытв-сці да спажывання; аб'ём прададзеных і купленых тавараў у грашовым выражэнні за пэўны прамежак часу. Адрозніваюць аптовы Т. і *рознічны тавараабарот*. Аптовы Т. уключае аб'ём продажу тавараў вытв. і збытавымі прадпрыемствамі арг-цыям рознічнага гандлю і прадпрыемствам для прамысл. перапрацоўкі, рознічны — уключае аб'ём рэалізацыі тавараў і паслуг насельніцтву ў абмен на яго грашовыя даходы рознічнай гандл. сеткай, прадпрыемствамі грамадскага харчавання і быт. абслугоўвання. Гл. таксама *Аптовы гандаль*.

ТАВАРАЗНА́ЎСТВА, прыкладная эканам. дысцыпліна, якая даследуе *спажывецкую вартасць* тавараў. Вывучае карысныя якасці *прадметаў працы*, заканамернасці фарміравання асартыменту тавараў і яго структуру, класіфікацыю, кадзіраванне, *стандартызацыю*, фактары, якія абумоўліваюць якасць тавараў, спосабы яе кантролю і ацэнкі, умовы захавання спажывецкай вартасці тавараў пры іх транспарціроўцы, захоўванні, рэалізацыі і эксплуатацыі, а таксама эстэтыку тавараў. Падзяляецца на Т. харчовых і нехарчовых тавараў.

Узнікла ў 16 ст. ў сувязі з развіццём знешнегандл. сувязей. Першая кафедра Т. расл. і жывёльных фармацэўтычных матэрыялаў заснавана ў *Падуанскім універсітэце* ў 1549. У Расіі адным з першых падручнікаў па Т. была «Гандлёвая кніга» (1575). Патрэбнасць у аб'ектыўнай ацэнцы спажывецкіх каштоўнасцей тавараў вызначыла неабходнасць даследавання складу, уласцівасцей і тэхналогіі перапрацоўкі сыравіны і матэрыялаў; лічылася, што Т. павінна грунтавацца на вывучэнні хіміі, фізікі і інш. прыродазнаўчых навук. Сукупнасць ведаў пра тавары, іх уласцівасці, класіфікацыю, спосабы захоўвання і спажывання выкладзены ў працах І.Г.Людовіцы «Асновы поўнай гандлёвай сістэмы» (1756, 2-е выд. 1789), І.Бекмана «Уводзіны ў таваразнаўства, або Вучэнні аб важнейшых і замежных таварах» (1774), М.Я.Кітары «Публічны курс таваразнаўства» (1860) і інш. Як самаст. дысцыпліна Т. пачало выкладацца ў канцы 18 ст. ў камерцыйных сярэдніх і ВНУ.

У пач. 20 ст. Т. сфарміравалася як навука. У 1907 у Маскве засн. першы камерцыйны ін-т, выдаваліся падручнікі. У пач. 1990-х г. у СССР у розных ВНУ было 38 кафедраў Т.

У Беларусі ў пач. 21 ст. Т. — адна з асн. дысцыплін пры падрыхтоўцы таваразнаўцаў, менеджэраў, экспертаў і інш. у *Беларускім эканамічным універсітэце*, Бел. гандлёва-эканам. ун-це спажывецкай кааперацыі (гл. *Гомельскі кааператыўны інстытут*), *Віцебскім тэхналагічным універсітэце*.

М.М.Нясмелаў.

ТАВА́РНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭ́ННЕ, сістэма мерапрыемстваў па давядзенні тавараў ад вытворцаў да рознічных гандл. арг-цый і прадпрыемстваў у колькасці і асартыменце, якія адпавядаюць попыту насельніцтва. Уключае аптовыя закупкі тавараў, іх дастаўку ў магазіны, захоўванне і падрыхтоўку да продажу.

ТАВА́РНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭ́ННЕ ГРО́ШАЙ, маса выпрабленых і пушчаных у продаж па дзеючых цэнах *тавараў*, якія забяспечваюць наяўнымі ці безнаяўнымі грашамі плацежаздольны попыт на іх прадпрыемстваў, прадпрымальнікаў, насельніцтва. Грошы называюць таварна не забяспечанымі, калі іх больш, чым кошт тавараў у бягучых рыначных цэнах. Наяўнасць такіх грошай — адна з прычын *інфляцыі*.

ТАВА́РНАЯ БІ́РЖА, рынак *аптовага гандлю* таварамі масавай вытв-сці, якія адпавядаюць вызначаным узорам (стандартам) і цэны на якія фарміруюцца пад уздзеяннем попыту і прапановы. Ствараецца шляхам добраахвотнага аб'яднання заснавальнікаў біржы: вытворцаў, уладальнікаў і спажыўцоў тавараў, пасрэднічых арг-цый, замежных фірм і інш. Адрозніваюць Т.б. рэальнага тавару і ф'ючэрсныя, на якіх заключаюцца безтаварныя пагадненні на пэўны тэрмін; закрытыя, дзе ўдзельнічаюць біржавыя пасрэднікі (*брокеры*), і адкрытыя — акрамя брокераў удзел у гандлі прымаюць і наведвальнікі. Для Т.б. характэрны: рэгулярнасць кірмашоў у пэўным месцы, уніфікацыя асн. патрабаванняў да якасці тавараў, умоў і тэрмінаў пастаўкі, свабодная купля і продаж — пакупнік вольны выбіраць прадаўца, вызначаць сваю цану і інш.

Узніклі ў Зах. Еўропе ў 16—17 ст. з сярэдневяковых кірмашоў. У 18—19 ст. сталі гал. формай унутр. і міжнар. аптовага гандлю. У Расіі ў пач. 20 ст. было больш за 150 Т.б. На Беларусі ў 1908 узнікла Мінская (лясная), напярэдадні 1-й сусв. вайны — Віцебская Т.б. У перыяд нэпа (да 1930) Т.б. існавалі ў СССР.

Найбуйнейшымі Т.б. з'яўляюцца Лонданская (каляровыя металы, збожжа, цукар і інш.), Нью-Йоркская (каўчук, бавоўна, кава і інш.), Міланская, Гамбургская, Амстэрдамская і інш.

ТАВА́РНАЯ ВЫТВО́РЧАСЦЬ, грамадская форма арганізацыі *вытворчасці*, пры якой прадукты выпрабляюцца для абмену праз куплю-продаж. Абумоўлена грамадскім *падзелам працы*, эканам. адасобленасцю вытворцаў, неабходнасцю абмену прадуктаў для забеспячэння грамадскіх патрэб праз рынак. Развіваецца і рэгулюецца ў адпаведнасці з аб'ектыўнымі эканам. законамі: вартасці, попыту і прапанавання, канкурэнцыі, грашовага абарачэння і інш. Узнікла ў перыяд першабытнаабшчыннага ладу, развівалася і набыла ўсеагульны характар ва ўмовах класічнага капіталізму і сучаснай рыначнай эканомікі, калі аб'ектам куплі-продажу робяцца ўсе фактары вытв-сці. Існуюць механізмы самаразвіцця і самарэгулявання Т.в., сваёй эканам. дзейнасцю дзяржава дапаўняе і накіроўвае гэтыя працэсы. У сацыяльна арыентаванай рыначнай эканоміцы, напр., можна вылучыць нетаварны сектар, у які ўваходзіць вытв-сць даброт, якія без удзелу рынку пераходзяць у сферу спажывання (фундаментальныя навук. даследаванні, бясплатныя адукацыя, ахова здароўя і інш.). Гл. таксама *Таварная гаспадарка*.

ТАВА́РНАЯ ГАСПАДА́РКА, тып гаспадаркі (вытворчасці, эканомікі), дзе выраб прадукцыі, выкананне работ ці паслуг арыентаваны на рынак, а сувязь паміж вытворцамі і спажыўцамі ажыццяўляецца праз куплю-продаж тавараў. Гл. таксама *Таварная вытворчасць*.

ТАВА́РНЫ ЗАПА́С, колькасць *тавару* вызначанага віду, які знаходзіцца ў сферы таварнага абарачэння, у працэсе руху ад вытворцы да спажыўца (транспартаванне, на складах) і спрыяе нармальнаму функцыянаванню гандлю. Не павінен быць залішні, таму што павялічваюцца выдаткі на захоўванне. Адрозніваюць Т.з. бягучага захоўвання (забяспечваюць штодзённыя патрэбы гандлю), сезонныя (для забеспячэння бесперабойнага гандлю ў перыяд сезоннай змены попыту і прапанавання), датэрміновага завозу (для гандлю ў цяжкадаступных па ўмовах надвор'я рэгіёнах), мэтавыя (на выпадак увядзення асобага становішча; гл. *Дзяржаўныя рэзервы*).

ТАВА́РНЫ ЗНАК, абазначэнне ці сімволіка, якая зарэгістравана на падставе дзеючага заканадаўства і ставіцца на *тавары* (часам на ўпакоўцы); садзейнічае адрозненню аднародных тавараў (паслуг) розных юрыд. або фіз. асоб і іх рэалізацыі. Можа мець слоўныя (у т.л. імёны ўласныя), літарныя, лічбавыя, аб'ёмныя абазначэнні або іх камбінацыі, любы колер ці колеравыя спалучэнні. Асн. патрабаванні да Т.з.: прастата, індывідуальнасць, распазнавальнасць, прывабнасць для спажыўцоў, адсутнасць элементаў герба, дзярж. сцяга і інш. абазначэнняў, што з'яўляюцца аб'ектамі выключнай уласнасці дзяржавы і ўрада. У Т.з. можна ўключаць скарочаныя ці поўныя назвы міжнар. і міжурадавых арг-цый, пячаткі, узнагароды і інш. знакі адрознення, як неахоўваемыя элементы, калі на гэта ёсць згода адпаведнага кампетэнтнага органа ці іх уладальніка. Рэгіструецца ў краіне, дзе фірма мае намер яго выкарыстоўваць. На сусв. рынку тавары, маркіраваныя Т.з., звычайна на 15—20% каштуюць даражэй, чым немаркіраваныя. Уладальнік Т.з. мае выключнае права на яго выкарыстанне, ён можа прадаць яго юрыд. або фіз. асобам па ліцэнзійных пагадненнях. Зарэгістраваны ў рамках міжнар. пагадненняў (напр., Парыжскай канвенцыі па ахове прамысл. уласнасці), карыстаецца аховай ва ўсіх краінах-удзельніцах і наз. сусветным Т.з. Разам з Т.з. у якасці фірменнага знака ўжываецца гандлёвая марка, якой абазначаюцца не адзін, а ўсе тавары пэўнай фірмы.

ТАВА́РНЫ КАПІТА́Л, у марксісцкай тэорыі адна з функцыянальных форм і трэцяя стадыя кругаабароту прамысл. *капіталу*. У рэчаіснай форме паўстае ў выглядзе пэўнай масы выраблеых на продаж тавараў. У вартасным выражэнні ўключае затрачаную на яго вытв-сць частку авансавага капіталу і прыбавачную вартасць. Па меры ўзбуйнення вытв-сці і пашырэння грамадскага *падзелу працы* адбываецца адасабленне функцый рэалізацыі Т.к. ў форме гандл. капіталу.

ТАВА́РНЫ ФЕТЫШЫ́ЗМ (ад франц. fétiche ідал), містычныя адносіны да тавараў, надзяленне іх звышнатуральнымі ўласцівасцямі; арэчаўленне вытв. адносін ва ўмовах таварнай вытв-сці. Заснаваны на тым, што стыхія рыначных адносін, якая пануе над людзьмі, знешне выступае ў выглядзе панавання над імі пэўных рэчаў. Ва ўмовах таварнай вытв-сці эканам. сувязі паміж людзьмі ажыццяўляюцца пры дапамозе тавараабмену, а лёс таваравытворцаў, іх дабрабыт цесна звязаны з лёсам выраблеых імі тавараў. Адносіны паміж людзьмі ва ўмовах рынку, дзе вызначальным фактарам вытв-сці з'яўляецца рух тавараў, таксама прымаюць форму адносін рэчаў. Такая залежнасць таваравытворцаў ад рыначнай кан'юнктуры параджае ў іх адносіны да тавару як звышнатуральнага феномена (фетыша), які ажыццяўляе самаст. рух і вызначае лёсы людзей. *А.Л.Падгайскі.*

ТАВА́РНЫЯ РЭЗЕ́РВЫ, частка *таварных запасаў*, якая ўключаецца ў вытв. працэс, калі той нечакана парушаецца.

ТАВА́РНЫЯ РЭСУ́РСЫ, прадметы спажывання, прызначаныя для рэалізацыі на ўнутр. рынку ці на экспарт у пэўны час і па канкрэтнай цане. Выяўляюць магчымасці таварнага рынку забяспечыць патрэбы насельніцтва. Крыніцамі ўтварэння Т.р. з'яўляюцца: прам-сць; с.-г. вытворчасць; тавары, якія выпускаюцца прыватнымі вытворцамі; *імпарт*; *таварныя запасы*. Т.р. ахопліваюць не ўсю прадукцыю прадметаў спажывання, паколькі частка яе застаецца ў вытворцаў для ўнутрыгасп. патрэб і натуральнага спажывання. Але яны могуць і перавышаць аб'ём прадукцыі за кошт пераходных запасаў і імпарту тавараў. Аб'ём Т.р. на рынку залежыць ад велічыні плацежаздольнага попыту, даступнасці тавараў для спажыўцоў, стабільнасці рынку, канкурэнцыі, сабекошту вытв-сці, дынамікі цэн, колькасці таваравытворцаў і іх зацікаўленасці ў вытворчасці і інш. Ва ўмовах пераходнай эканомікі дзяржава з'яўляецца сувязным звяном у кіраванні таварнымі сістэмамі; з гэтай мэтай распрацоўваюцца на перспектыву балансы попыту і прапанавання таварных груп, устанаўліваюцца заданні на закупку ў айч. вытворцаў тавараў для ўнутр. рынку, рэгламентуюцца цэны і ўзроўні рэнтабельнасці сацыяльна-значнай прадукцыі і прадукцыі прадпрыемстваў-манапалістаў. *Р.П.Валевіч.*

ТАВА́РЫ НАРО́ДНАГА СПАЖЫВА́ННЯ, спажывецкія тавары, прадукцыя для продажу насельніцтву з мэтай выкарыстання яе для задавальнення матэрыяльных і культурных патрэбнасцей; сукупнасць прадуктаў спажывання. Адрозніваюць харч. і нехарч. Т.н.с. Харчовыя — гэта прадукты харчавання: хлебныя, малочныя, мясныя, рыбныя, бакалея, агародніна, садавіна і інш. Пералік і структура іх асартыменту мяняецца з развіццём вытв-сці, ростам тавараабароту, імпарту і інш. Да нехарчовых адносяцца тавары культ.-быт. і гасп. прызначэння, прадукцыя лёгкай прам-сці і г.д. Некаторыя віды прадукцыі адначасова бываюць вытв.-тэхн. прызначэння і Т.н.с. (тканіна, буд. матэрыялы, інструменты па апрацоўцы розных матэрыялаў і інш.).

ТАВАРЫ́СКІ СУД, грамадскі орган, які выбіраецца ў працоўных калектывах, навуч. установах, вайск. часцях, пры



Таварны знак акцыянернага таварыства «Атлант».

домакіраўніцтвах, сельскіх населеных пунктах і пасёлках адкрытым галасаваннем на агульных сходах калектываў. Парадак арганізацыі і дзейнасці Т.с. рэгламентуецца Палажэннем пра Т.с., зацверджаным Вярх. Саветам БССР 29.3.1977 (з наступнымі зменамі і дапаўненнямі). Т.с. разглядае справы пра парушэнні прац. дысцыпліны (прагул, спазненне), матэрыялы аб адм. парушэннях, а таксама некаторыя грамадз. справы (спрэчкі жыльцоў па выкарыстанні камунальнай уласнасці і аплаце камунальных паслуг, маёмасныя спрэчкі паміж грамадзянамі на невял. суму і інш.). Т.с. правамоцны ўжываць да парушальнікаў меры грамадскага ўздзеяння, ускласці грашовы штраф пэўных памераў і інш. спагнанні, прадугледжаныя Палажэннем. *Г.А.Маслыка.*

ТАВАРЫ́СТВА АМА́ТАРАЎ НАВУ́К, Навуковае таварыства, Навучальнае таварыства, тайная арг-цыя, заснаваная ў пач. 1820 навучэнцамі Свіслацкай гімназіі. Створана пад уплывам выдаўца газ. «Dekada Polska» («Польская дэкада») В.*Гельтмана*. Старшыня т-ва Д.Шлаеўскі, сакратар Р.Вашчыловіч. Праект статута арг-цыі ад 7.1.1820 складаўся з 7 раздзелаў, 30 параграфаў; члены т-ва падзяляліся на кандыдатаў, правадз. членаў, членаў-карэспандэнтаў, ганаровых членаў. Падтрымлівалі ідэю адраджэння Польшчы ў межах 1772, імкнуліся «сумеснымі сваімі працамі ўдасканальваць айчынную мову і памнажаць творы польскага красамоўя». Вядома 15 членаў т-ва. Заканчэнне 6-га (апошняга) класа, відаць, прывяло да самароспуску т-ва, але ёсць меркаванне, што яно існавала да арышту Гельтмана ў 1821.

В.В.Швед.

ТАВАРЫ́СТВА АМА́ТАРАЎ РАСІ́ЙСКАЙ СЛАВЕ́СНАСЦІ, літаратурна-навуковае таварыства ў 1811—1930 (з перапынкам у 1837—58) пры Маскоўскім ун-це. Старшыні: М.Загоскін, А.Хамякоў, М.Пагодзін, І.Аксакаў, Ф.Буслаеў, П.Сакулін і інш. На пасяджэннях выступалі А.К.Талстой, І.Тургенеў, А.Фет, Ф.Дастаеўскі, Л.Талстой, І.Бунін, В.Брусаў і інш. Т-ва выдала: «Працы ТАРС» (ч. 1—20, 1812—21), «Творы ў прозе і вершах» (ч. 1—7, 1822—28), «Тлумачальны слоўнік...» У.Даля (ч. 1—4, 1863—66), «Песні, сабраныя П.В.Кірэеўскім» (вып. 1—10, 1860—74; новая серыя, вып. 1—2, 1911—29), зб-кі «Тургенеў і яго час» (1923), «Пушкін» (т. 1—2, 1924—30).

ТАВАРЫ́СТВА АПЕ́КІ НАД ЭМІГРА́НТАМІ, дабрачынная арганізацыя, якая дзейнічала з канца 1890-х г. да 1915 у Варшаве. Асн. мэта — дапамога эмігрантам, якія ад'язджалі ў краіны Паўн. і Паўд. Амерыкі. Мела свой статут. Аказвала матэрыяльную, фін. і інфарм. дапамогу эмігрантам. У 1912 утварыла філіял у Вільні, які выдаў на бел. мове брашуру Язэпа Акаловіча «Рады для эмігрантоў, каторые едуць у Амэрыку, а такжэ размовы беларуско-англіцкіе» (1912). У 1915 спыніла сваю дзейнасць.

А.В.Ціхаміраў.

ТАВАРЫ́СТВА АХВО́ТНІКАЎ БЕЛАРУ́СКАГА НАРО́ДНАГА ШТУКА́РСТВА ў Петраградзе. Існавала ў 1918 пры падтрымцы *Беларускага нацыянальнага камісарыята*. Чл.-заснавальнікі — Ч.Родзевіч (ініцыятар стварэння), З.Жылуновіч (Ц.Гартны), І.Лагун, Б.Тарашкевіч, Г.Багдановіч. Мела на мэце садзейнічаць развіццю бел. л-ры, т-ра, вуснай нар. творчасці, архітэктуры, музыкі, клапаціцца пра помнікі мастацтва. Мела аддзяленне ў Пецяргофскім р-не Петраграда. Пры т-ве існаваў драм. гурток. У памяшканні т-ра драмы і камедыі 20.4.1918 т-ва наладзіла бел. вечарынку, на якой прысутнічала каля 300 чал. Калекцыя запісаў бел. нар. песень з архіва т-ва ў 1922 перададзена *Беларускай драматычнай студыі* ў Маскве.

Літ.: Мастацтва Савецкай Беларусі. Т. 1. Мн., 1976. *В.У.Скалабан.*

ТАВАРЫ́СТВА БЕЛАРУ́САЎ І МАЛАРО́САЎ, дабрачынная арганізацыя, створаная для падтрымкі эмігрантаў бел. і ўкр. паходжання ў г. Гранд-Рэпідз (ЗША, штат Мічыган). Дзейнічала ў 1913—14. Мела свой статут. Асн. задачу заснавальнікі т-ва бачылі ва ўстанаўленні трывалай сувязі паміж слав. народамі; перавага аддавалася асобам, якія нарадзіліся ў Беларусі і Украіне. Т-ва спрабавала захаваць нац. адметнасць бел. і ўкр. эмігрантаў у ЗША, аказвала ім матэрыяльную і фін. дапамогу.

Літ.: Кіпель В. Беларусы ў ЗША. Мн., 1993. *А.В.Ціхаміраў.*

ТАВАРЫ́СТВА БЕЛАРУ́СКАЙ АСВЕ́ТЫ (ТБА), культурна-асветная арганізацыя ў Зах. Беларусі ў 1932—37. Створана ў Вільні на аснове *Цэнтральнага саюза культурных і гаспадарчых арганізацый*, зарэгістравана 22.12.1932. Арганізатары і кіраўнікі А.І.Луцкевіч, Р.К.Астроўскі, А.Трэпка, Я.Шнаркевіч, С.Кароль, Я.Бартуль, В.Манкевіч і інш. З 1933 выдавала газ. «Родны край». Мэтай ТБА з'яўлялася дзейнасць па развіцці бел. культуры, пашырэнні школьнай і пазашкольнай асветы на бел. мове, уздым маральнага ўзроўню, вывучэнне польскай культуры, культ. адметнасцей інш. народаў, якія жывуць на супольнай з беларусамі тэрыторыі. Знаходзілася пад арганізац. кіраўніцтвам *беларускай санацыі*. З 1933 утварала гурткі, адкрыла 33 б-кі-чытальні, наладжвала лекцыі, спектаклі вандроўных т-раў, разгарнула выдавецкую дзейнасць. ТБА дамагалася адкрыцця бел. школ, умацавання ўцалелых Віленскай і Навагрудскай бел. гімназій, выступала супраць *паланізацыі*, хоць не адмаўляла супрацоўніцтва з польскімі культ.-асв. арг-цыямі, асуджала паліт. рэпрэсіі ў БССР. Кіраўніцтва ТБА заклікала *Таварыства беларускай школы* (ТБШ) да сумесных школьных акцый. Дзейнасць ТБА жорстка крытыкавалі дзеячы КПЗБ, Бел. хрысціянскай дэмакратыі. Паланафільскі характар і шлях кампрамісу не пазбавіў ТБА ад праследаванняў польскіх улад, фін. цяжкасцей. З-за паліт. меркаванняў т-ва адмовілася далучыцца да заключанага ў лют. 1936 пагаднення паміж ТБШ і *Беларускім інстытутам гаспадаркі і культуры* аб адзінстве дзеянняў у школьнай справе, назваўшы яго «акцыяй Камінтэрна». Забаронена польскімі ўладамі 20.8.1937.

Літ.: Ладысев В.Ф. В борьбе за демократические права и свободы. Мн., 1988; Вабішчэвіч А. Нацыянальная школа ў Заходняй Беларусі (1921—1939 гг.) // Бел. гіст. часоп. 1994. № 2. *А.М.Вабішчэвіч.*

ТАВАРЫ́СТВА БЕЛАРУ́СКАЙ МО́ВЫ ІМЯ Ф.СКАРЫНЫ (ТБМ), бел. добраахвотная грамадская арганізацыя. Засн. ў 1989 у Мінску. Арганізатары-заснавальнікі: Саюз пісьменнікаў Беларусі, мін-вы адукацыі, культуры Рэспублікі Беларусь, ін-ты мовазнаўства і літаратуры Нац. АН Беларусі, Дзярж. к-т Рэспублікі Беларусь па друку, Бел. фонд культуры, т-ва «Радзіма», Бел. т-ва дружбы і культ. сувязі з замежнымі краінамі, Нац. тэлерадыёкампанія Рэспублікі Беларусь. Старшыні т-ва: Н.С.Гілевіч, з 1997 Г.М.Бураўкін, з 1999 А.А.Трусаў. Вышэйшы кіруючы орган — з'езд, які склікаецца 1 раз у 2 гады, кіруючы орган паміж з'ездамі — Рэсп. рада ТБМ, выканаўчы орган — Сакратарыят. Рэвізійная камісія кантралюе дзейнасць выбарных органаў і структурных падраздзяленняў т-ва. Мэты т-ва: аднаўленне ў грамадстве статусу да роднай мовы як да нац. святыні, пашырэнне яе ўжытку ва ўсіх сферах жыцця рэспублікі, усебаковае развіццё і захаванне яе чысціні і самабытнасці. Пры т-ве дзейнічае 8 камісій: адукацыйная, арганізацыйная, выдавецкая, па культуры мовы і ўдасканаленні правапісу, па сувязях з замежнымі краінамі, па тапаніміцы і гіст. сімволіцы, тэрміналагічная і інш. Працуе ініцыятыўная група па стварэнні Бел. нац. ун-та, бел. бацькоўскі к-т, кніжны і відэаклуб. Мае б-ку стараж. бел. кнігі (больш за 600 асобнікаў рэдкіх бел. кніг). За час існавання т-ва выдадзена больш за 20 кніг мастацкай, навуковай, навукова-папулярнай, асветніцкай л-ры, у т.л. тэрміналагічныя слоўнікі па фізіцы, вышэйшай матэматыцы, зоапаразіталогіі, батаніцы, бел. вайсковы слоўнік і інш. З сак. 1990 выдае штотыднёвую газ. «Наша слова». У 1990 прымала ўдзел у падрыхтоўцы Закона «Аб мовах у Беларускай ССР», арганізацыі кантролю за выкананнем гэтага закона, у стварэнні «Дзяржаўнай праграмы развіцця беларускай мовы і іншых нацыянальных моў у Рэспубліцы Беларусь» (1991). ТБМ правяло рэсп. канферэнцыі: «Шляхі станаўлення нацыянальнай беларускай школы» (1990), «Інтэлігенцыя

і нацыянальна-культурнае адраджэнне Беларусі» (1991), «Беларуская мова і нацыянальна-дзяржаўны суверэнітэт Беларусі», «Шляхі ўдасканалення правапісу беларускай літаратурнай мовы» (1992), сумесна з Мін-вам адукацыі па праблемах бел. тэрміналогіі (1994, 1995), «Закон аб мовах — вынікі і перспектывы», «Беларуская тапаніміка. Гісторыя і сучаснасць» (2000). Падтрымлівае беларускамоўныя класы і школы, прапагандуе родную мову і культуру. Удзельнічала ў перапісе насельніцтва Беларусі (1999). Ім перададзена бязвыплатна каля 10 тыс. асобнікаў кніг для рэгіянальных суполак ТБМ, а таксама для вясковых, школьных і раённых б-к. Структуры т-ва працуюць у кожным раёне Мінска, ва ўсіх буйных гарадах і 64 раёнах Беларусі, а таксама ў Вільні, Рызе, Іркуцку, Маскве, С.-Пецярбургу, Севастопалі, існуе суполка ў Германіі. На 1.1.2001 у ТБМ больш як 5500 актыўных членаў і каля 10 000 прыхільнікаў. Мае сваю афіцыйную сімволіку.

А.А.Трусаў.

ТАВАРЫ́СТВА БЕЛАРУ́СКАЙ ШКО́ЛЫ (ТБШ), культурна-асветная арг-цыя ў Зах. Беларусі ў 1921—36. Створана на аснове рашэння Цэнтр. бел. школьнай рады ў Вільні, статут зацверджаны 1.7.1921. Да яго далучылася ТБШ у Радашковічах, заснаванае Б.А.Тарашкевічам 7.12.1921. Акрамя Тарашкевіча, кіраўнікамі і актыўнымі дзеячамі ТБШ у розны час былі Р.К.Астроўскі, Ф.І.Валынец, Я.Е.Гаўрылік, І.М.Грэцкі, І.С.Дварчанін, П.П.Кізевіч, П.С.Крынчык, А.І.Луцкевіч, М.М.Марцінчык, П.В.Мятла, А.С.Неканда-Трэпка, С.К.Паўловіч, М.І.Пяткевіч, С.А.Рак-Міхайлоўскі, А.В.Станкевіч, Ф.І.Стацкевіч, А.М.Уласаў, Я.Шнаркевіч і інш. Паводле статута 1926 вышэйшым органам ТБШ быў з'езд, паміж з'ездамі — Гал. ўправа, якая мела Наглядную раду, акр. і пав. ўправы. Друкаваныя органы — «Бюлетэнь ТБШ», час. «Летапіс ТБШ» (гл. «*Беларускі летапіс*»), газ. «Шлях». Гал. мэта т-ва — «распаўсюджваць і дапамагаць асвеце сярод беларусаў, пашыраць беларускія школы і беларускую асвету наогул». ТБШ выступала супраць паланізацыі, сац. прыгнёту, праводзіла шырокую дзейнасць па адкрыцці бел. школ, павышала агульнаадук. і культ. ўзровень насельніцтва, яго нац. свядомасць; наладжвала курсы для настаўнікаў, аказвала матэрыяльную і навуч.-метадычную дапамогу Віленскай, Радашковіцкай, Навагрудскай, Клецкай і інш. бел. гімназіям і пач. школам, нелегальна накіроўвала моладзь на вучобу за мяжу, у т.л. ў БССР. З утварэннем *Беларускага пасольскага клуба* адстойвала нац. правы на парламенцкім узроўні. Для павышэння эфектыўнасці навучання і выхавання, абароны нац. адукацыі правяло ў 1923 у Вільні з'езд педагогаў бел. гімназій. Удзельнічала ў падрыхтоўцы падручнікаў, вучэбных дапаможнікаў, арганізавала кнігавыдавецкую дзейнасць (з 1921 у Вільні працавала *Выдавецтва Таварыства беларускай школы*). З 1926 ТБШ атрымала магчымасць легальнай працы ў Віленскім, Навагрудскім, Палескім і Беластоцкім ваяв. Частка дзеячаў ТБШ з-за непрызнання рэв.-дэмакр. поглядаў стварыла ў 1926 альтэрнатыўную культ.-асв. арг-цыю — *Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры* (БІГіК). У канцы 1927 у Зах. Беларусі дзейнічала 12 акр. управу ТБШ — у Баранавічах, Беластоку, Вілейцы, Гродне, Глыбокім, Косаве, Лідзе, Міры, Навагрудку, Свіслачы, Слоніме; у Вільні яе функцыі выконвала праўленне цэнтр. гар. гуртка. Першы з'езд ТБШ (28—29.12.1927, Вільня) пастанавіў дамагацца адкрыцця дзярж. бел. школ, бел. гімназій, настаўніцкіх курсаў і семінарый, стварэння бел. аддзелаў пры Віленскім і Палескім школьных папячыцельствах, заснавання кафедры беларусазнаўства ў Віленскім ун-це імя С.Баторыя і інш. Да сярэдзіны 1928 колькасць гурткоў дасягнула 430 (14—15 тыс. чал.), у сярэдзіне 1930 — больш за 500 (каля 30 тыс. чал.). Т-ва выкрывала антыбел. сутнасць школьнага заканадаўства Польшчы, арганізавала масавыя кампаніі падачы заяў аб адкрыцці бел. школ. У выніку ў 1927/28 навуч. г. адкрыта 78 бел. і польска-бел. школ, выпускнікам Віленскай бел. гімназіі дадзена права здаваць экзамены на атэстат сталасці, наладжваліся метадычныя канферэнцыі і інш. Для правядзення асв. работы сярод насельніцтва ТБШ стварала гурткі самаадукацыі, б-кі, хаты-чытальні, клубы, нар. дамы, арганізоўвала драм. і харавыя калектывы, наладжвала іх выступленні. Т-ва выказвала рашучы пратэст супраць закрыцця бел. гімназій і школ, выступала за дэмакратызацыю нар. адукацыі. Легальны характар ТБШ шырока выкарыстоўвала КПЗБ. Пасля забароны польскімі ўладамі ў жн. 1928 Гал. управы (да` жн. 1929) адбылася паларызацыя поглядаў у кіраўніцтве ТБШ наконт характару яго дзейнасці. Дзеячы КПЗБ і клуба «*Змаганне*» выступалі за палітызацыю работы т-ва, прадстаўнікі нац.-дэмакр. інтэлігенцыі настойвалі абмежавацца толькі асв. працай, што ўспрымалася як згодніцтва. На нелегальным з'ездзе ТБШ у Вільні 19.5.1929 былі прыняты рэзалюцыі (агульнапалітычная, пратэст супраць праследаванняў з боку польскіх улад), а таксама выключаны з т-ва Астроўскі, Луцкевіч, Неканда-Трэпка, Шнаркевіч, А.Коўш і інш. Польскія ўлады перашкаджалі дзейнасці ТБШ, забаранялі акр. і пав. з'езды, управы, гурткі, клубы, б-кі, арыштоўвалі і судзілі кіраўнікоў, актывістаў; закрылі бел. гімназіі ў Радашковічах (1929), Клецку (1931), Навагрудку (1934), шэраг бел. пачатковых школ. У 1928 — ліп. 1930 забаронена дзейнасць 6 акр. управ і больш як 300 гурткоў. 1—4.2.1933 у Вільні адбыўся суд над Гал. управай ТБШ. Абвінавачанне ў падрыхтоўцы «камуністычнай змовы» не было пацверджана — Стацкевіч, Р.Шырма, Пяткевіч былі апраўданы, М.Церах і Ю.Саковіч атрымалі па 3, Я.І.Скурко (М.Танк) — 2 гады турэмнага зняволення. Забаронена польск. ўладамі 2.12.1936.

Літ.: Мятла П. Аб таварыстве беларускай школы і яго барацьбе. Мн., 1932; Полуян В.А. Революционно-демократическое движение в Западной Белоруссии (1927—1939 гг.). Мн., 1978; Народная адукацыя і педагагічная навука ў Беларусі (1917—1945). Мн., 1993; Вабішчэвіч А. Нацыянальная школа ў Заходняй Беларусі (1921—1939 гг.) // Бел. гіст., часоп. 1994. № 2; Яго ж. Таварыства беларускай школы (1921—1936 гг.) // Там жа. 1997. № 1; Яго ж. Таварыства беларускай школы: першыя гады існавання // Спадчына. 1996. № 5; Ладысеў У. Выпрабаванні часам і жыццём: (Да 75-годдзя ўтварэння і дзейнасці Кампартыі Зах. Беларусі) // Бел. гіст. часоп. 1998. № 4.

А.М.Вабішчэвіч.

ТАВАРЫ́СТВА БЫЛЫ́Х ПАЛІТКАТАРЖА́Н І ССЫЛЬНАПАСЯЛЕ́НЦАЎ. Існавала ў СССР у 1921—35. Створана па ініцыятыве Ф.Э.Дзяржынскага, Я.Э.Рудзутака, Е.М.Ярослаўскага і інш. Аказвала матэрыяльную дапамогу б. палітказтаржанам і ссыльнапасяленцам, арганізоўвала іх выступленні, успаміны, даклады, лекцыі. Важным кірункам дзейнасці т-ва былі збор, вывучэнне і выданне гіст.-дакумент. матэрыялаў. У 1921—23 аддзяленні т-ва ўзніклі ў Віцебску, Гомелі, Мінску. Бел. аддзяленне да 1928 правяло 3 канферэнцыі. Навукова-даследчую працу члены т-ва вялі ў секцыях: па гісторыі дзекабрызму, рэвалюцыі 1905—07, нарадавольцаў і інш. Яны абмяркоўвалі даклады і мемуары, рыхтавалі да друку зб-кі дакументаў, манаграфіі. Т-ва выдавала час. «*Каторга и ссылка*», біябібліягр. слоўнік «Дзеячы рэвалюцыйнага руху ў Расіі» (1927—34), «Бюллетень Центрального совета Всесоюзного общества бывших политкаторжан и ссыльнопоселенцев» (1929—33), у якіх ёсць біягр. артыкулы і звесткі пра дзеячаў, чый лёс звязаны з Беларуссю. Супрацоўнічала з Гістпартам, Ін-там Маркса—Энгельса—Леніна пры ЦК ВКП(б) і іх філіяламі на месцах, з *Таварыствам старых бальшавікоў*. Т-ва спыніла дзейнасць у 1935 ва ўмовах разгортвання ў СССР паліт. рэпрэсій.

У.М.Міхнюк.

ТАВАРЫ́СТВА ВАЕ́ННЫХ СЯБРО́Ў, гл. «*Ваенныя сябры*».

ТАВАРЫ́СТВА ВЫВУЧЭ́ННЯ МАГІЛЁЎСКАЙ ГУБЕ́РНІ, гісторыка-краязнаўчае таварыства ў Магілёве ў 1902—16. Засн. па ініцыятыве Е.Р.*Раманава* як «Таварыства вывучэння Беларускага краю». Мела статут (зацверджаны ў сак. 1905). У сувязі з утварэннем гіст.-краязнаўчых т-ваў у Віцебску, Мінску і інш. гарадах у 1913 рэарганізавана ў Т.в.М.г. Члены: Раманаў, І.А.Сербаў, А.П.Сапуноў, М.М.Турбін. Вывучала гісторыю, этнаграфію і прыроду Беларусі, пераваж-

на Магілёўскай губ. Выдала працу Раманава «Першакрыніцы для гісторыі Магілёўскага краю» (вып. 1, 1916), у якую ўвайшлі «Баркалабаўскі летапіс» і «Падарожныя заметкі стольніка П.А.Талстога аб Магілёўскай губерні (1697—1699)». Падрыхтавала да выдання 4-ы выпуск зб. «*Магілёўская даўніна*» і інш. У 1-ю сусв. вайну эвакуіравана ў Алэсу, дзе спыніла дзейнасць.

Літ.: Бандарчык В.К. Гісторыя беларускай этнаграфіі: Пачатак XX ст. Мн., 1970.

ТАВАРЫ́СТВА ГІСТО́РЫКАЎ-МАРКСІ́СТАЎ БССР, грамадская навуковая арганізацыя ў 1927—33. Дзейнічала як аднайм. філіял Усесаюзнага т-ва і працавала пад яго кіраўніцтвам. Яго папярэднікам было Бел. марксісцкае т-ва, якое працавала з 1923. Парт. кіраўніцтва БССР паставіла перад т-вам задачы: выкрыццё «буржуазных нацыяналістычных канцэпцый», даследаванне праблем метадалогіі гісторыі, вывучэнне гісторыі Беларусі і асабліва рэв. руху, а таксама гісторыі Расіі, усеаг. гісторыі. Т-ва правяло шэраг дыскусій па канкрэтных праблемах гісторыі, абмеркавала пытанні перыядызацыі гісторыі Беларусі і праграму гэтага курса для ВНУ, паўстання 1863—64, генезісу капіталізму і развіцця рабочага руху на Беларусі, характару газ. «Наша ніва», крытычна разгледзела асн. працы С.Х.Агурскага, М.В.Доўнар-Запольскага, З.Х.Жылуновіча (Ц.Гартнага), У.М.Ігнатоўскага, М.М.Нікольскага, У.І.Пічэты і інш. Выпусціла «Марксісцкі зборнік» (№ 1—2, 1929—31). Перастала існаваць у пач. 1933. *У.М.Міхнюк.*

ТАВАРЫ́СТВА ГО́МЕЛЬСКІХ УРАЧО́Ў, гл. *Гомельскае таварыства ўрачоў.*

ТАВАРЫ́СТВА З АБМЕЖАВА́НАЙ АДКА́ЗНАСЦЮ, таварыства, заснаванае дзвюма і больш асобамі, статутны фонд якога падзелены на долі, вызначаныя ўстаноўчымі дакументамі. Удзельнікі такога т-ва не адказваюць па яго абавязацельствах, але нясуць рызыку страт, звязаных з дзейнасцю т-ва ў межах вартасці ўнесеных імі ўкладаў. Удзельнікі т-ва, якія ўнеслі ўклады не поўнасцю, нясуць салідарную адказнасць па яго абавязацельствах у межах вартасці няўплачанай часткі ўкладу кожнага з удзельнікаў. Фірменнае найменне такога т-ва павінна ўтрымліваць у яго назве словы «з абмежаванай адказнасцю». Прававое становішча такога т-ва, правы і абавязкі яго ўдзельнікаў вызначаюцца нормамі заканадаўства, выкладзенымі ў Цывільным кодэксе Рэспублікі Беларусь. Устаноўчымі дакументамі т-ва з'яўляюцца ўстаноўчы дагавор, падпісаны яго заснавальнікамі, і зацверджаны імі статут. *Г.А.Маслыка.*

ТАВАРЫ́СТВА ЗААХВО́ЧВАННЯ МАСТА́ЦТВАЎ. Існавала ў 1821—1929 у Пецярбургу (да 1875 наз. Т-ва заахвочвання мастакоў). Засн. мецэнатамі І.Гагарыным, П.Кікіным, А.Дзмітрыевым-Мамонавым і інш. Т-ва арганізоўвала выстаўкі, конкурсы, набывала творы, накіроўвала мастакоў за мяжу для ўдасканальвання адукацыі (К.Брулоў, А.Іванаў і інш.), узнагароджвала іх медалямі. З 1857 мела рысавальную школу. Выдавала час. «Искусство и художественная промышленность» і серыю «Мастацкія каштоўнасці Расіі».

ТАВАРЫ́СТВА З'ЯДНА́НЫХ СЛАВЯ́Н, тайная рэв. арганізацыя, створаная ў пач. 1823 у г. Наваград-Валынскі на аснове б. Т-ва сяброў прыроды братамі А.І. і П.І. *Барысавымі* і паліт. ссыльным Ю.К.Люблінскім. Уваходзілі афіцэры, дробныя чыноўнікі, службоўцы, усяго больш за 50 чл. Выступала праціўнікам прыгоннага права, саслоўнага ладу і самадзяржаўя; дамагчыся «дэмакратычнага праўлення» збіралася шляхам узбр. паўстання з удзелам народа. Члены т-ва вялі агітацыю сярод салдат, планавалі стварэнне вясковых вучылішчаў, каб уплываць на паліт. актыўнасць сялян. Гал. мэта т-ва — аб'яднанне ўсіх слав. і некат. суседніх народаў (Расія, Польшча, Багемія, Маравія, Венгрыя з Трансільваніяй, Сербія, Малдавія, Валахія, Далмацыя) у адну федэратыўную рэспубліку. У вер. 1825 т-ва па прапанове С.І.*Мураўёва-Апостала* і М.П.*Бястужава-Руміна* аб'ядналася з *Паўднёвым таварыствам дзекабрыстаў* на аснове яго праграмы. Не менш чым 12 «славян» запісаліся ў атрад царазабойцаў. 26 членаў т-ва ў 1826 асуджаны Вярх. крымінальным судом па справе *дзекабрыстаў*.

Літ.: Нечкина М.В. Общество соединенных славян. М.; Л., 1927; Яе ж. Движение декабристов. Т. 2. М., 1955; Швед В.В. Беларускія старонкі гісторыі дзекабрыстаў. Мн., 1998. *В.В.Швед.*

ТАВАРЫ́СТВА МАСТАКО́Ў-СТАНКАВІ́СТАЎ (ОСТ, Общество станковистов). Існавала ў 1925—31 у Маскве. Засн. групай выпускнікоў Вышэйшых маст.-тэхн. майстэрняў пад кіраўніцтвам Д.Штэрнберга. Члены т-ва (П.Вільямс, Б.Волкаў, А.Ганчароў, А.Дайнека, А.Лабас, Ю.Піменаў, А.Тышлер і інш.) сцвярджалі станковыя формы мастацтва, ставілі за мэту адлюстроўваць у іх тыповыя з'явы сав. рэчаіснасці. Іх творам, прысвечаным пераважна індустрыялізацыі, жыццю сав. горада, спорту, уласцівы гранічная лаканічнасць формы, дынаміка кампазіцыі, графічная дакладнасць малюнка. Вядучыя мастакі ОСТ адыгралі пэўную ролю ў развіцці станковага і манум. жывапісу, кніжнай графікі, плаката, сцэнаграфіі. Т-ва арганізавала 4 выстаўкі ў 1925—28.

Літ.: Костин В. ОСТ (Общество станковистов). Л., 1976.

ТАВАРЫ́СТВА МІ́НСКІХ УРАЧО́Ў, гл. *Мінскае таварыства ўрачоў.*

ТАВАРЫ́СТВА ПАДХАРУ́НЖЫХ, змова Высоцкага, тайная арг-цыя, заснаваная 15—16.12.1828 у варшаўскай Школе падхарунжых пяхоты па ініцыятыве падпаручніка П.Я.*Высоцкага*. Ва ўстаноўчым пасяджэнні ўдзельнічалі Ю.Гуроўскі, Ю.Дабравольскі, К.Каршніцкі, А.Ласкі, К.Махнацкі, С.Панінскі, К.Пашкевіч, С.Ціхоўскі. Духоўным папярэднікам прызнавалі кіраўніка Нац. масонства маёра В.*Лукасінскага*. Т-ва падтрымлівала сувязь з сеймавай апазіцыяй (калішанамі і інш.), мела кантакты з І.*Лялевелем*, Ю.У.*Нямцэвічам* і інш. Мэтай т-ва была падрыхтоўка ўзбр. паўстання. Першы раз планавалася ўзняць яго ў сакавіку, другі раз — 20.5.1829 у час каранацыі Мікалая I у якасці польскага караля, але планы не здзейсніліся. Са жн. 1830 пачала фарміравацца структура больш разгалінаванага т-ва, у якое апрача падхарунжых уступалі студэнты, інтэлігенцыя. Да кастр. ў т-ва ўваходзіла каля 200 малодшых афіцэраў; яго секцыі ўтвораны ў большасці варшаўскіх палкоў пяхоты, у асобных батальёнах і батарэях, Варшаўскім ун-це (гурткі М.Швейзера, Н.Шыманскага, Я.Барткоўскага). Новы план паўстання прадугледжваў забойства цэсарэвіча Канстанціна Паўлавіча, разбраенне рус. войска ў Варшаве і нейтралізацыю польскіх генералаў, верных цэсарэвічу. У сувязі з арыштамі студэнтаў і часткі падхарунжых, зменай міжнар. абставін (падрыхтоўка рас. інтэрвенцыі з удзелам польскай арміі ў Бельгію) вырашана прыспешыць план паўстання (гл. *Паўстанне 1830—31*).

В.В.Швед.

ТАВАРЫ́СТВА ПЕРАСО́ЎНЫХ МАСТА́ЦКІХ ВЫ́СТАВАК, гл. *Перасоўнікі.*

ТАВАРЫ́СТВА ПРАМЯНІ́СТЫХ, гл. «*Прамяністыя*».

ТАВАРЫ́СТВА «РАДЗІ́МА», гл. *Беларускае таварыства па сувязях з суайчыннікамі за рубяжом.*

ТАВАРЫ́СТВА СТАРЫ́Х БАЛЬШАВІКО́Ў. Існавала ў 1922—35 пры Гістпарце, потым Ін-це Маркса—Энгельса—Леніна пры ЦК ВКП(б). Старшыні М.С.Альмінскі (да 1931), Е.М.Яраслаўскі. Гал. мэта — дапамога ВКП(б) у выхаванні моладзі на рэв. і парт. традыцыях. Т-ва арганізоўвала вечары ўспамінаў і сустрэч старых бальшавікоў з моладдзю, збірала матэрыялы і ўспамін ы па гісторыі партыі і рэв. руху, якія друкавала ў «Бюллетене Общества старых большевиков» (1931—33) і гіст.-рэв. зб. «Стары бальшавік» (1930—34). З 1931 існавала Бел. аддзяленне Усесаюзнага т-ва (старшыня прэзідыума А.Я.Балцін, чл. М.П.Гнілякевіч, Л.М.Спалінскі , Кеніг, Дамброўскі і інш.). З 1933 філіялы Бел. аддзялення дзейнічалі ў Віцебску, Гомелі, Магілёве. Члены Бел. аддзялення выступалі з дакладамі і ўспамінамі па гісторыі рэвалюцыі 1905—07, Лют. і Кастр. рэвалюцый 1917, пытаннях нац. палітыкі, збіралі матэрыялы і дакумен-

ты, запісвалі ўспаміны пра грамадз. вайну і ваен. інтэрвенцыю. Т-ва каардынавала сваю працу з *Таварыствам былых паліткатаржан і ссыльнапасяленцаў*, Ін-там гісторыі партыі пры ЦК КП(б)Б. Паводле пастановы ЦК ВКП(б) у жн. 1935 Т.с.б. скасавана. Бел. аддзяленне самаліквідавалася ў маі 1935. *У.М.Міхнюк.*

ТАВАРЫ́СТВА СЯБРО́Ў НАВУ́К, Таварыства аматараў навук. Існавала ў Вільні ў 1907—39. Даследавала гісторыю, этнаграфію і культуру, прыроду Літвы, Беларусі і Польшчы. У 1907—22 выдавала «Rocznik Towarzystwa...» («Штогоднік таварыства...»), у 1923—39 час. *«Атэнэум віленьске»*, дзе асвятлялася гісторыя і культура зямель ВКЛ, публікаваліся дакумент. матэрыялы, бібліяграфія даследаванняў па гэтых пытаннях. Т-ва стварыла б-ку (больш за 50 тыс. кніг, рукапісы пісьменнікаў, дзеячаў культуры, у т.л. творы і рукапісы А.*Міцкевіча*), якой былі падораны рукапісы і б-кі Я.*Карловіча*, Я.Шванскага, збор М.Федароўскага, Я.Французовіча, б-ка Э.*Ажэшкі*. Аснову калекцыі музея склалі зборы А.Заборскага, В.Шукевіча, Французовіча (фотаздымкі, замалёўкі бел. адзення). Архіўныя матэрыялы т-ва (лісты Ф.Багушэвіча, дакументы пра К.Каліноўскага і інш.) зберагаюцца ў Дзярж. гіст. архіве Літвы, кнігі — у Цэнтр. б-цы АН Літвы, калекцыі па мастацтве і нумізматыцы — у Маст. музеі Літвы, археал., этнагр. і гіст. экспанаты — у Гіст.-этнагр. музеі Літвы. *В.А.Цыбуля.*

ТАВАРЫ́СТВА ЎРАЧО́Ў ГРО́ДЗЕНСКАЙ ГУБЕ́РНІ, гл. *Гродзенскае таварыства ўрачоў.*

ТАВАРЫ́СТВА ФІЛАМА́ТАЎ, гл. *Філаматы.*

ТАВАРЫ́СТВА ЎРАЧО́Ў МАГІЛЁЎСКАЙ ГУБЕ́РНІ. Існавала ў 1862—1917 у г. Магілёў. Засн. паводле ініцыятывы ўрача К.А.Пабо. Садзейнічала развіццю мед. навукі і практыкі, грамадскай гігіены і інш. Ажыццяўляла сан. кантроль за гар. тэрыторыяй, арганізоўвала курсы санітараў і дэзінфектараў, бясплатны прыём хворых, праводзіла нар. чытанні, таксама імкнулася ахапіць урачэбнай дапамогай сельскае насельніцтва. Па рэкамендацыі т-ва ў 1892 у час эпідэміі халеры адкрыты халерны барак, праводзілася бясплатная выдача лякарстваў. У 1911 правяло збор сродкаў на барацьбу з сухотамі; стварыла мясц. аддзел Усерас. лігі барацьбы з сухотамі. Члены т-ва праводзілі медыка-тапагр. і статыст. даследаванні Магілёва. Выдавала свае «Пратаколы» і «Працы», абменьвалася імі з інш. мед. т-вамі Рас. імперыі, дасылала іх у Швейцарыю для рэферыравання ў замежных часопісах. *А.П.Малчанаў.*

ТАВАРЫ́СТВА ЯКУ́БА КО́ЛАСА, Беларускае таварыства Якуба Коласа, назва *Беларускага культурнага таварыства «Белавежа»* ў Аргенціне ў 1945—49.

ТАВАРЫ́СТВЫ АХО́ВЫ ПРЫРО́ДЫ, грамадскія арг-цыі для садзейнічання ахове прыроды і прапаганды прыроданаховых ідэй. Узніклі ў Францыі (1854), Вялікабрытаніі (Каралеўскае т-ва аховы птушак; 1889), Расіі (Усерасійскае Т.а.п.; 1924). Дзейнасць Т.а.п. ў свеце аб'ядноўвае *Міжнародны саюз аховы прыроды і прыродных рэсурсаў* (МСАП). Гл. таксама *Беларускае таварыства аховы прыроды.*

ТАВАРЫ́СТВЫ ПА СУМЕ́СНАЙ АПРАЦО́ЎЦЫ ЗЯМЛІ́ (ТАЗ), найпрасцейшая форма добраахвотнага аб'яднання сялян для сумеснай гасп. дзейнасці. Існавалі ў СССР да суцэльнай *калектывізацыі* сельскай гаспадаркі. Далучалі сялян да вядзення калект. гаспадаркі.

У т-вах абагульвалася толькі зямля і сродкі вытв-сці, а праца сялян аб'ядноўвалася ў перыяды с.-г. работ. Прыбыткі размяркоўваліся адпаведна колькасці абагуленай зямлі, колькасці і якасці працы. Існавала таксама размеркаванне прыбыткаў па колькасці едакоў, выкарыстаных сродкаў вытв-сці і рабочай жывёлы. За кошт прыбыткаў т-ва набывалі сродкі вытв-сці і прадукцыйную жывёлу. У 1929 у СССР ТАЗы складалі 60% агульнай колькасці калект. гаспадарак. На Беларусі ў 1927 было 78 т-ваў. У час масавай калектывізацыі яны ператвораны ў *сельскагаспадарчыя арцелі.*

ТАГАНО́ВІЧ Анатоль Дзмітрыевіч (н. 10.11.1952, Мінск), бел. вучоны ў галіне біяхіміі. Д-р мед. н. (1993), праф. (1995). Скончыў Мінскі мед. ін-т (1976), дзе і працуе. Навук. працы па пытаннях механізма сурфактантнай сістэмы лёгкіх у норме і паталогіі, функцыян. змен клетак лёгкіх пры ўплыве на арганізм забруджвальнікаў навакольнага асяроддзя і лек. прэпаратаў.

Тв.: Индуцированное сурфактантом изменение уровня эндогенных регуляторов метаболизма в макрофагах легких (разам з В.К.Кухтой. Н.Дз.Тагановіч) // Докл. АН БССР. 1991. Т. 35, № 4; Спектральна-флюарэсцэнтнае даследаванне сурфактанту лёгкіх у пацукоў пры блеаміцын-індуцыраваным пнеўмафіброзе (разам з В.К.Кухтой. Я.В.Баркоўскім) // Весці АН Беларусі. Сер. біял. навук. 1992. № 2; Основы биохимии. М., 1999 (у сааўт.)

ТАГАНРО́Г, горад у Растоўскай вобл. Расіі, порт у *Таганрогскім заліве* Азоўскага м. Засн. ў 1698 як крэпасць і база рас. ваен. флоту. 284 тыс. ж. (2000). Чыг. станцыя. Прам-сць: машынабудаванне і металаапр. (ВА: «Чырвоны кацельшчык», «Прэсмаш», «Вібрапрыбор»; з-ды: камбайнавы, суднарамонтны, гандл. і электратэрмічнага абсталявання), чорная металургія, хім., лёгкая, харчасмакавая. Ін-ты: пед., радыётэхнічны. Драм. тэатр. Музеі: краязн., горадабудаўніцтва і быту, карцінная галерэя, музей-запаведнік А.П.Чэхава (нарадзіўся ў Т.).

ТАГАНРО́ГСКІ ЗАЛІ́Ў. У паўн.-ўсх. частцы Азоўскага м. Аддзелены ад мора косамі Доўгай і Беласарайскай. Даўж. каля 140 км, шыр. каля ўваходу 31 км, глыб. каля 5 м. У Т.з. размешчаны Пясчаныя а-вы. Ледастаў са снеж. да сакавіка. Упадаюць рэкі: Дон, Кальміус, Міус, Ея. Парты: Марыупаль (Украіна), Таганрог, Ейск (Расія).



Р.Тагор.

ТА́ГАРД (Thagard) Норман (н. 3.7.1943, г. Марыяна, штат Фларыда, ЗША), касманаўт ЗША. Магістр навук у галіне тэхнікі (1966). Д-р медыцыны (1977). Скончыў Тэхаскі ун-т. З 1978 у групе касманаўтаў НАСА. Здзейсніў 5 палётаў у складзе экіпажаў касм. караблёў (КК): 18—24.6.1983 і 29.4—6.5.1985 на КК «Чэленджэр», 4—8.5.1989 на КК «Атлантыс», 22.1—30.1.1992 на КК «Дыскаверы», 14.3—7.7.1995 на КК «Саюз ТМ-21» і арбітальнай станцыі «*Мір*» (пасадка на КК «Атлантыс»). Правёў у космасе 140,4 сут. *У.С.Ларыёнаў.*

ТАГЕ́ТЭС, род кветкавых раслін, тое, што *аксаміткі.*

ТАГО́Р Рабіндранат (Тхакур Рабіндранатх; 7.5.1861, г. Калькута, Індыя — 7.8.1941), індыйскі пісьменнік, грамадскі дзеяч. Вучыўся ў Англіі (1878—80). Друкаваўся з 1875. Пісаў на бенгальскай мове. У першых зб-ках вершаў «Вячэрнія песні» (1882), «Ранішнія песні» (1883), драме «Помста прыроды» (1884) пантэістычныя і жыццесцвярджальныя матывы. Распрацаваў канцэпцыю «бажаства жыцця» («джыбон-дэбота») пра адзінства чалавека і прыроды (паэт. цыклы «Маношы», 1890; «Залатая лодка», 1893; «Імгненні», 1900; зб. «Гітанджалі», 1910). Раманы «Гора» (1907—10), «Дом і мір» (1915—16), цыкл вершаў «Палёт жураўлёў» (1914—16) прасякнуты ідэямі сац. і нац. вызвалення краіны. Уражанні ад паездак у краіны Азіі, Еўропы і Амерыкі ў «Дзённіку падарожжа на Захад» (1929), «Пісьмах аб Расіі» (1931) і інш. Сац. праблематыка ў лірычным зб. «Усходні напеў» (1925), алегарычных драмах «Вызвалены паток» (1922) і «Чырвоныя алеандры» (1924). Раман «Чатыры часткі» (1934), аповесці «Дзве сястры»

(1933) і «Кветнік» (1934), паэт. зб-кі «Завяршэнне» (1932), «Апошняя актава» (1935), «Новынародженыя» (1940) і інш., зборнікі апавяданняў і публіцыстыкі скіраваны супраць расавай дыскрымінацыі, рэліг. нецярпімасці, каставай сістэмы і бяспраўя жанчыны, прасякнуты нац.-вызв. ідэямі. Творчасць Т. адыграла выключную ролю ў станаўленні бенгальскай літ. мовы. Ён узбагаціў паэзію новымі формамі і вершаванымі памерамі, заклаў асновы жанру апавядання і развіў жанр сац.-псіхал. рамана, паклаў пачатак паліт. лірыцы. Эстэт. погляды Т. адлюстраваны і ў мастацтве (аўтар некалькіх тысяч песень, 2000 малюнкаў і карцін). Песня «Душа народа» — гімн Індыі, «Мая залатая Бенгалія» — гімн Рэспублікі Бангладэш. Значную ўвагу аддаваў пытанням тэорыі і практыкі нар. асветы (адкрыў школу, заснаваў ун-т). На бел. мову яго творы пераклалі Я.Колас, С.Грахоўскі, А.Мардвілка, А.Разанаў, Я.Семяжон, К.Станкевіч, Г.Шаранговіч. Нобелеўская прэмія 1913.

Тв.: Бел. пер. — Садоўнік. Мн., 1927; Крушэнне. Мн., 1958; Выбранае. Мн., 1976; Гітанджалі // Далягляды. 1992. Мн., 1992; Рус. пер. — Соч. Т. 1—12. М., 1961—65; Собр. соч. Т. 1—4. М., 1981—82.

Літ.: Рабиндранат Тагор: Жизнь и творчество. М., 1986; Рабиндранат Тагор: Биобиблиогр. указ. М., 1961.

В.С.Вайткевіч.

ТАГРУ́Л-БЕК (каля 993 — вер. 1063), заснавальнік *сельджукскай дзяржавы*. Разам з братам Чагры-бекам узначальваў сельджукскае аб'яднанне качавых агузаў (туркменаў). У 1038 захапіў ч. Харасана і абвешчаны ў Нішапуры султанам. У 1040 разбіў войска султана Масуда Газневіда (гл. *Газневіды*); паміж 1040 і 1055 заваяваў Харэзм, б. ч. Ірана, Азербайджан, Ірак. У 1049 пачаў заваяванне Арменіі. У 1055 уступіў у Багдад. Абасідскі халіф Каім быў вымушаны надаць Т.-б. тытул султана, а потым — «цара Усходу і Захаду».

ТАДАРО́ЎСКІ Пётр Яфімавіч (н. 25.8.1925, г. Бобрынец Кіраваградскай вобл., Украіна), расійскі аператар і рэжысёр кіно. Нар. арт. Расіі (1985). Скончыў Усесаюзны дзярж. ін-т кінематаграфіі (1954). Творчасці Т. ўласцівы сац. і псіхал. дакладнасць, уменне паэтычна перадаваць паўсядзённасць. Сярод аператарскіх работ маст. фільм «Вясна на Зарэчнай вуліцы» (з Р.Васілеўскім, 1956) і інш. Рэжысёр кінафільмаў «Вернасць» (1965, прыз Міжнар. кінафестывалю ў Венецыі, 1966), «Фокуснік» (1968), «Гарадскі раманс» (1971), «Апошняя ахвяра» (1976), «Любімая жанчына механіка Гаўрылава» (1982), «Ваенна-палявы раман» (1984), «Інтэрдзяўчынка» (1989), «Анкор, яшчэ анкор» (1993), «Якая цудоўная ігра» (1995), «Рэтра ўтраіх» (1998) і інш. Дзярж. прэмія Расіі 1995.

ТАДЖ-МАХА́Л, помнік індыйскай архітэктуры перыяду *Вялікіх Маголаў* на беразе р. Джамна за 2 км ад г. Агра. Пабудаваны ў 1630—52 (арх., верагодна, Устад-Іса і інш.) як маўзалей жонкі султана Шах-Джахана Мумтаз-Махал. У ім жа пахаваны і сам султан, звергнуты з трона і зняволены ўласным сынам. 5-купальны будынак (выш. з цэнтр. купалам каля 74 м) на платформе (выш. 7 м) з 4 мінарэтамі па вуглах. У плане мае выгляд квадрата са зрэзанымі вугламі. Аблiцаваны белым паліраваным мармурам з інкрустацыяй з самацветаў. Фасады аздоблены стральчатымі аркамі, рэльефамі, афармлены парталамі-айванамі. Інтэр'ер маўзалея дэкарыраваны мазаікай з паўкаштоўных і каштоўных парод каменю, разьбой па белым мармуры. Надмагіллі абкружаны мармуровай шырмай ажурнай разьбы. Помнік валодае незвычайным акустычным эфектам. Каля Т.-М. знаходзяцца: саборная мячэць (1648) і гасцініца для паломнікаў, рэгулярны кіпарысавы сад з вадаёмам, каналамі і фантанамі. Маўзалей уключаны ЮНЕСКА у спіс *Сусветнай спадчыны*.



Тадж-Махал.

Я.Ф.Шунейка.

ТАДЖЫ́КІ, народ, асн. насельніцтва *Таджыкістана* (3,86 млн. чал.). Агульная колькасць у свеце 8,28 млн. чал. (сярэдзіна 1990-х г.). Жывуць таксама ў Афганістане (3,7 млн. чал.), Узбекістане (934 тыс. чал.), Іране (50 тыс. чал., у астане Харасан), Рас. Федэрацыі (38 тыс. чал.), Кіргізіі (34 тыс. чал.), Казахстане (25 тыс. чал.). Гавораць на *таджыкскай мове*. Вернікі пераважна мусульмане-суніты.

ТАДЖЫКІСТА́Н (Тоҷикистон), Рэспубліка Таджыкістан (Ҷумҳурии Тоҷикистон), дзяржава на ПдУ Сярэдняй Азіі. Мяжуе на З і ПнЗ з Узбекістанам, на Пн з Кіргізіяй, на ПдУ з Кітаем і на Пд з Афганістанам. Пл. 143,1 тыс. км². Нас. 6,2 млн. чал. (2001). Сталіца — г. *Душанбе*. У складзе Т. 3 адм. вобласці і Горна-Бадахшанскі аўтаномны раён.





Герб і сцяг **Таджыкістана**.



ская аўт. вобласць (гл. *Горны Бадахшан*). Дзярж. мова — таджыкская (фарсі). Нац. свята — Дзень незалежнасці (9 вер.).

Дзяржаўны лад. Т. — рэспубліка. Дзейнічае канстытуцыя 1994 (са зменамі і дапаўненнямі 1999). Кіраўнік дзяржавы і выканаўчай улады — прэзідэнт, які выбіраецца на ўсеагульных выбарах на 7 гадоў. Вышэйшы заканадаўчы орган — двухпалатны парламент (Маджлісі алі) у складзе 63 дэпутатаў.

Прырода. Т. — горная краіна, 93 % тэр. займаюць горы, каля 50 % — на выш. больш за 3 тыс. м. На ПнЗ адгор'і Цянь-Шаня (Курамінскі хр.), на Пд ад іх горы сістэмы *Гісара-Алая* (хр. Туркестанскі, Зераўшанскі, Гісарскі, Алайскі), на ПдУ *Памір* (хр. Заалайскі, Музкол, Рушанскі, Акадэміі Навук з найвышэйшай вяршыняй пік Ісмаіла Самані — 7495 м). Паміж хрыбтамі міжгорныя катлавіны і даліны (Гісарская, Кафірніганская, Вахшская, ч. Ферганскай). Характэрна высокая сейсмічнасць. Карысныя выкапні: поліметал. і уранавыя руды, вальфрам, вісмут, нафта, прыродны газ, каменная соль. Крыніцы мінер. вод. Клімат рэзка кантынентальны, сухі. У далінах і на раўнінах да выш. 500 м сярэдняя т-ра студз. ад -1 °С на Пн да 3 °С на Пд, ліп. адпаведна 27 °С і 30 °С, ападкаў 150—300 мм за год. У высакагорных раёнах сярэдняя т-ра студз. ад -18 °С да -20 °С, ліп. 10—12 °С, ападкаў да 1200 мм за год. У гарах больш за 8 тыс. ледавікоў, найб. Федчанкі (651,7 км^2), Грум-Гржымайлы (143 км^2). Гал. рэкі: Сырдар'я, Зераўшан, Амудар'я з прытокамі Вахш і Пяндж, Кафірніган. Рэкі багатыя гідраэнергіяй (патэнцыяльныя запасы 32,8 млн. кВт, 2-е месца ў СНД пасля Рас. Федэрацыі). Буйныя азёры: Каракуль, Сарэзскае, Іскандэркуль і інш. Вадасховішчы: Нурэкскае, Фархадскае, Кайраккумскае. Буйныя арашальныя каналы: Гісарскі, Дальверзінскі, Паўн.-Ферганскі і інш. Глебы пераважна пустынныя пясчаныя (70%), у перадгор'ях — шэраземы, у гарах — карычневыя, у высакагор'ях — горна-стэпавыя і горна-лугавыя. На нізінных раўнінах пераважае травяністая і паўхмызняковая расліннасць пустынь. Пад лесам і хмызнякамі каля 4% тэр. У далінах рэк тугайныя лясы з таполі, на сухіх горных схілах — з фісташкі, на вільготных — грэцкі арэх, туркестанскі клён, усх. чынара (платан), дзікія яблыні і вінаград, грушы і алыча. У складзе жывёльнага свету ў гарах буры мядзведзь, тыбецкі воўк, азіяцкі леапард, снежны барс (ірбіс), у перадгор'ях — дзік, бухарскі высакародны алень, чаротавы кот, дзікакабраз. Шмат птушак (фазан, чапля, грыф, чорная курапатка), паўзуноў (кобра, гюрза, вадзяны вуж, агамы). Запаведнікі: Тыгровы Яр, Раміт, Даштыджум.

Насельніцтва. Большасць насельніцтва — таджыкі (62,3%). Жывуць узбекі (23,5%), рускія (каля 2%), татары (1,4%), кіргізы (1,3%) і інш. Пануючая рэлігія — іслам. Большасць вернікаў — мусульмане-суніты, ёсць мусульманешыіты, у Горным Бадахшане — абшчыны мусульман-ісмаілітаў. Сярэдняя шчыльн. 42,8 чал. на 1 км^2. Найб. шчыльна заселены міжгорныя даліны. Гар. насельніцтва 26,8%. Найб. гарады (тыс. ж., 1999): Душанбе — 500, Худжанд — 164, Куляб — 79,3. У эканоміцы занята 1,8 млн. чал., у т.л. ў сельскай і лясной гаспадарцы — 52%, у прамысці — 17%, у сферы паслуг — 31%.

Гісторыя. Тэр. Т. заселена чалавекам у палеаліце. Першыя гістарычна вядомыя дзяржавы *Согд* і *Бактрыя* ўзніклі тут у 1-й пал.1-га тыс. да н. э., гал. заняткам іх насельніцтва было арашальнае земляробства. У 6—4 ст. да н.э. яны ўвайшлі ў склад *Ахеменідаў дзяржавы*. У 329—327 да н.э. гэту тэр. заваяваў *Аляксандр Македонскі*, які падавіў упартае супраціўленне сагдыйцаў на чале са *Спітаменам*. З 312 да н.э. ў складзе дзяржавы *Селеўкідаў*, у 250—140 да н.э. — *Грэка-Бактрыйскага царства*, якое заваявана качавымі плямёнамі *тахараў*. У 1—3 ст. н.э. тэр. Т. ў складзе *Кушанскай дзяржавы*, да пач. 6 ст. заваявана *эфталітамі*, у 560-я г. — *Цюркскім каганатам*, які ў сярэдзіне 7 ст. распаўся на мноства дробных дзярж. утварэнняў. У 8 ст. яны заваяваны арабамі, якія задушылі супраціўленне мясц. насельніцтва, у т.л. *Муканы паўстанне*, і ўключаны ў склад *Амеядаў халіфата*, а ў 750 — *Абасідаў халіфата*. Іслам выцесніў ранейшыя рэлігіі — зараастрызм, будызм, хрысціянства, нестарыянства. У 9—10 ст. ад улады араб. халіфаў вызвалілася Сярэдняя Азія, дзе склалася *Саманідаў дзяржава* са сталіцай у г. *Бухара*. У гэты час у выніку змяшэння мясц. сагдыйскага насельніцтва з прышлым араба-іранскім элементам склаўся таджыкскі этнас, што дае падставу тадж. гісторыкам лічыць дзяржаву Саманідаў першай тадж. дзяржавай. Пасля падзення ў 999 Саманідаў розныя часткі тэр. Т. былі ў складзе *Караханідаў дзяржавы*, *Каракітаяў дзяржавы*, дзяржаў *Газневідаў* і *Гурыдаў*. З 1212 усе тадж. землі ў складзе *Харэзмшахаў дзяржавы*, якая ў 1219—21 заваявана манголамі (гл. *Мангольскія завяванні*); многія гарады разбураны, а насельніцтва моцна скарацілася. З 1224 б.ч. Сярэдняй Азіі, у т.л. землі з тадж. насельніцтвам, у складзе *Дзагатайскага (Чагатайскага) улуса*, які ў 1260-я г. стаў дзяржавай, незалежнай ад Мангольскай імперыі. Пасля яго распаду (сярэдзіна 14 ст.) тэр. Т. з 1370-х г. у складзе вялізнай дзяржавы *Цімура*, сталіцай



Да арт. **Таджыкістан**. У адгор'ях Паміра.



Да арт. **Таджыкістан**. Падножжа ледавіка Масквіціна.



Да арт. **Таджыкістан**. Канал і тунэль, па якім вада з Нурэкскага вадасховішча паступае ў Дангарынскі раён.

якой быў г. Самарканд. Пасля смерці Цімура (1405) яго дзяржава распалася на шэраг дзярж. утварэнняў на чале з яго нашчадкамі — *Цімурыдамі*. Адзін з іх — Мухамед Джахангір стварыў фактычна незалежнае ўладанне з цэнтрам у Гісары, куды ўвайшла значная ч. тэр. Т. У 1500 узбекі на чале з Шэйбані-ханам скінулі ўладу Цімурыдаў і завалодалі іх землямі. Пасля разгрому ў 1510 Шэйбані-хана *Сефевідамі* ўзніклі 2 узб. дзяржавы з цэнтрамі ў Харэзме і *Мавераначры*. Апошняя з іх пасля пераносу сталіцы ў канцы 14 ст. ў Бухару атрымала назву *Бухарскага ханства* (з 1747 *Бухарскі эмірат*), у склад якога ўвайшлі і землі Т. У 1710 з Бухарскага ханства вылучылася Какандскае ханства, куды ўвайшоў паўн. Т. з цэнтрам у г. Худжанд (Хаджэнт). У 1866 рас. войскі занялі Худжанд і Ура-Цюбе, какандскі хан прызнаў пратэктарат Расіі. У 1868 ваен. нашэсце Расіі прымусіў і бухарскага эміра прызнаць рас. пратэктарат. Пасля падаўлення Какандскага паўстання 1873—76 Какандскае ханства скасавана, яго тэр. далучана да Туркестанскага ген.-губернатарства, у склад якога з 1868 уваходзіла і паўн.-ўсх. ч. бухарскіх уладанняў з Самаркандам. Паводле рус.-брыт. пагаднення 1895 бухарскія ўладанні на Пд ад р. Пяндж, дзе пражывала значнае тадж. насельніцтва, адышлі да Афганістана; у сваю чаргу да Бухарскага эмірата далучаны землі Зах. Памірa; Усх. Памір перайшоў пад рас. кантроль (з 1905 увесь Памір). У Туркестанскім ген.-губернатарстве (краі) у 1886 замест традыц. ўмоўнага землеўладання ўведзена прыватная ўласнасць на зямлю (фактычна зямельная рэформа пачала праводзіцца з 1870-х г. інж.-ген. К.П.*Каўфманам*). Выступленне насельніцтва Худжанда 17.7.1916 паклала пачатак *Сярэднеазіяцкаму паўстанню 1916*. Пасля Лют. рэвалюцыі 1917 у Худжандзе, Ура-Цюбе і Канібадаме створаны Саветы. У Бухарскім эміраце актывізаваліся *младабухарцы*, якія патрабавалі бурж.-дэмакр. рэформ. 30.4(13.5).1917 у Худжандзе створаны Выканком рас. Часовага ўрада. Сав. ўлада ўсталявалася 24.11(7.12).1917 у Худжандзе, у ліп. 1918 — ва Ура-Цюбе, у канцы 1918 — на Памірy. У вер. 1920 Чырв. Армія заняла г. Бухара, дзе ў кастр. 1920 абвешчана *Бухарская Народная Савецкая Рэспубліка* (БНСР), у пач. 1921 заняла кішлак Душанбе і б.ч. Усх. Бухары. На тэр. Т. разгарнуўся масавы антысав. рух — *басмацтва*, які ў кастр. 1921 узначаліў дзеяч руху *младатуркаў*, б. ваен. міністр Турцыі Энвер-паша. Да вясны 1922 яго атрады занялі Усх. Бухару. Пасля гібелі Энвер-пашы (жн. 1922) барацьбу працягвалі атрады Ібрагім-бека (да 1926). У вер. 1924 БНСР ператворана ў Бухарскую Сав. Сацыяліст. Рэспубліку, якая далучылася да СССР. Паўн. раёны Т. ўваходзілі ў склад Туркестанскай Аўт. Сав. Сацыяліст. Рэспублікі (засн. ў крас. 1918).

У выніку *нацыянальна-дзяржаўнага размежавання савецкіх рэспублік Сярэдняй Азіі* 12.3.1925 створана Тадж.АССР у складзе Узб. ССР. У яе ўвайшлі Гармскі, Кулябскі, Гісарскі, Курган-Цюбінскі і ч. Сарнасійскага вілаятаў Бухарскай ССР і 12 валасцей Туркестанскай АССР. У снеж. 1924 асобная Памірская вобл. ператворана ў Горна-Бадахшанскую аўт. акругу, якая далучана да Тадж. АССР. 16.10.1929 абвешчана Тадж. ССР, да якой далучана Худжандская акруга. У 1925—26 праведзена агр. («зямельна-водная») рэформа. З 1929 пачалася *калектывізацыя* сельскай гаспадаркі. У Вял. Айч. вайну больш за 50 тыс. воінаў з Т. ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі СССР, у т.л. 54 сталі Героямі Сав. Саюза; каля 60 тыс. чал. загінула. Да канца 1980-х г. з дапамогай інш. сав. рэспублік Т. з адсталай ускраіны ператварыўся ў індустр.-агр. краіну, дзе асаблівае развіццё атрымалі электраэнергетыка, горназдабыўная і хім. прам-сць, машынабудаванне і металаапрацоўка; значныя поспехі дасягнуты ў ахове здароўя і адукацыі, хоць і захоўвалася адноснае адставанне Т. ад інш. рэспублік СССР. Пачатак *перабудовы* ў СССР (1985) актывізаваў тадж. нац. рух. У 1989 тадж. мова абвешчана дзяржаўнай. Ствараліся апазіц. да Камуніст. партыі Т. (КПТ)





Да арт. **Таджыкістан**. Статак якаў на горнай пашы.

Да арт. **Таджыкістан**. Нурэкская ГЭС.

паліт. арг-цыі: Растахез (Адраджэнне), Дэмакр. партыя Т. (ДПТ). У лют. 1990 у Душанбе адбыліся масавыя антыўрадавыя хваляванні. 25.8.1990 Вярх. Савет Тадж. ССР прыняў Дэкларацыю аб дзярж. суверэнітэце. У ліст. 1990 уведзена пасада прэзідэнта Т., на якую абраны К.Махкамаў, які пасля жніверьскіх падзей 1991 у Маскве падаў у адстаўку. 9.9.1991 абвешчана незалежнасць Рэспублікі Т. Яе прэзідэнтам абраны Р.Набіеў, але выступленні аб'яднанай апазіцыі прымусілі і яго пайсці ў адстаўку (май 1992). Паліт. канфлікт перарос у грамадз. вайну паміж выхадцамі з розных рэгіёнаў Т. У выніку ўзбр. сутыкненняў загінула больш за 50 тыс. чал., каля 80 тыс. уцяклі за мяжу. У снеж. 1992 Душанбе занялі атрады Тадж. нар. фронту. Кіраўніком дзяржавы Вярх. Савет Т. абраў Э.*Рахмонава*, у ліст. 1994 ён выбраны прэзідэнтам Т. (перавыбраны ў 1999). Кааліцыя з Растахез, ДПТ і Партыі ісламскага адраджэння стварыла Аб'яднаную тадж. апазіцыю (АТА), якая, выкарыстоўваючы базы на тэр. Афганістана, разгарнула партыз. вайну супраць цэнтр. ўрада. У выніку перагавораў Рахмонава і лідэраў АТА у 1997 заключана пагадненне пра мірнае ўрэгуляванне канфлікту, вяртанне бежанцаў, разбраенне баевікоў АТА, іх амністыю і далучэнне АТА да паліт. працэсу. У знешняй палітыцы Т. арыентуецца на цеснае супрацоўніцтва з краінамі цэнтр.-азіяцкага рэгіёна і Расіяй. На яго тэр. знаходзяцца рас. войскі і пагранічнікі. Т. — чл. ААН (з 1992), СНД (з 1991), Еўрап. банка рэканструкцыі і развіцця (з 1992), Арг-цыі эканам. супрацоўніцтва (з 1993), Міжнар. валютнага фонду (з 1993), Арг-цыі ісламскай канферэнцыі (з 1993) і інш. міжнар. арг-цый. Дыпламат. адносіны з Рэспублікай Беларусь устаноўлены 5.9.1996.

У Т. дзейнічаюць паліт. партыі: Камуніст. партыя Т., Нар.-дэмакр. партыя Т., Сацыяліст. партыя, Дэмакр. партыя Т., Ісламская партыя адраджэння Т. і інш.

Гаспадарка. Т. — аграрна-індустр. краіна. Валавы ўнутр. прадукт (ВУП) у 1998 склаў 6 млрд. дол. (990 дол. на душу насельніцтва). Доля сельскай гаспадаркі ў структуры ВУП 27%, прам-сці і буд-ва — 26,9%, сферы паслуг — 46,1%. Грамадз. вайна і яе вынікі абмежавалі магчымасці эканам. развіцця краіны, адбылося рэзкае скарачэнне прамысл. і с.-г. вытв-сці. У 2000 аб'ём прамысл. прадукцыі склада ў 42%, сельскай гаспадаркі — 73% да ўзроўню 1991. Наглядаецца тэндэнцыя да паляпшэння становішча; дэкларавацы курс на рэфармаванне эканомікі і пераход да рынкавых форм гаспадарання, але паранейшаму захоўваецца і дырэктыўнае дзярж. рэгуляванне. На долю дзярж. сектара прыпадае каля 53% занятых, кааператываў, акц. т-ваў, прыватнага сектара — 47%. Аснова эканомікі — сельская гаспадарка. С.-г. ўгоддзі займаюць 4,15 млн. га, у т.л. пад ворывам 0,76 млн. га, сенажацямі і пашай 3,39 млн. га. Каля 0,7 млн. га паліўных зямель. Да 80% с.-г. угоддзяў эрадзіравана, на 15% ворыва засоленыя глебы. Вядучая галіна сельскай гаспадаркі — раслінаводства. Вырошчваюць збожжавыя культуры (пшаніца, ячмень, кукуруза, рыс); з тэхн. — бавоўнік (пераважна тонкавалакністыя сарты), алейныя (лён-кудраш, кунжут), эфіраалейныя (герань), тытунь. Бульбаводства, агародніцтва і бахчаводства. На Пн і ПдЗ развіты вінаградарства і садоўніцтва (яблыкі, абрыкосы, персікі, вішні, гранаты, інжыр, міндаль, цытрусавыя). Збор (млн. т, 1999) збожжа — 0,5, бульбы — 0,2, агародніны — 0,4. Мяса-воўнавая і мяса-малочная жывёлагадоўля. На Пн і ПдЗ развіта каракульваводства. Пагалоўе (тыс. галоў, 2000) буйн. раг. жывёлы — 911,5, авечак — 1620, коз — 625, птушак — 600. На Усх. Памiры разводзяць якаў. Вытв-сць мяса (забойная вага) — 30 тыс. т, малака — 310 тыс. т, яек — 23 млн. шт. Развіта шаўкаводства. Прамысловасць развіваецца ў асноўным на мясц. рэсурсах. На долю металургічнай прам-сці прыпадае 49,5%, паліўна-энергет. комплексу — 8,9%, маш.-буд. і металаапрацоўкі — 1,1%, лёгкай — 13,2%, харч. — 16,1%. Металургічная прам-сць звязана са здабычай і абагачэннем руд каляровых і рэдкіх металаў (горна-металургічны камбінат у Анзобе, абагачальныя ф-кі ў Кансаі і Чарух-Дайроне). Аснова каляровай металургіі — вытв-сць алюмінію ў г. Турсунзадэ. Паліўна-энергет. комплекс грунтуецца на здабычы нафты (20 тыс. т, на Пн і Пд), прыроднага газу (40 млн. м³), бурага вугалю (20 тыс. т) і вытв-сці электраэнергіі (14,3 млрд. кВт·гадз, 2000) пераважна на ГЭС. Працуюць Нурэкская, Галаўная, Байпазінская (на р. Вахш), Кайраккумская (на р. Сырдар'я) і інш. ГЭС. Буйныя ЦЭЦ — у г. Душанбе, г. п. Яван. Вытв-сць прадукцыі машынабудавання і металаапрацоўкі ў 2000 складала 14,9% да ўзроўню 1991. У Душанбе прадпрыемствы па выпуску халадзільнікаў і маразільнікаў (1,7 тыс. шт., 2000), рамонце машын і абсталявання. Лёгкая прам-сць прадстаўлена ачысткай бавоўны (Турсунзадэ, Шаартуз, Курган-Цюбе, Канібадам), вытв-сцю баваўняных і шаўковых тканін (12,7 млн. м², Душанбе, Худжанд), абутку (80 тыс. пар), швейных вырабаў, дываноў. У харч. прам-сці развіты алейная, мясная, малочная, кансервавая, вінаробная. Вытв-сць (тыс. т, 2000) алею — 14,3, мяса — 1,1, цэльна-малочнай прадукцыі — 2,9. Хім. прам-сць у г.п. Яван (11 тыс. т азотных угнаенняў) і Душанбе (пластмаса). Вытв-сць буд. матэрыялаў, у т.л. цэменту. Транспарт чыг. і аўтамабільны. Даўж. чыгунак 500 км, аўтадарог 13,6 тыс. км, у т.л. з цвёрдым пакрыццём 12,7 тыс. км. Асн. грузаперавозкі на чыг. транспарце — 1324,8 тыс. ткм, на аўтамаб. — 117,1 тыс. ткм (2000). Асн. чыгунка Тэрмез—Куляб, аўтадарогі Ош—Харог, Душанбе—Харог, Душанбе—Худжанд. Аэрапорты ў Душанбе, Худжандзе і Кулябе. Курорты: Абігарм, Зумрат, Хаджа-Абігарм, Шаамбары. Экспарт (1459,3 млн. дол., 2000) электраэнергіі, неапрацаванага алюмінію, бавоўны, тытуню. Імпарт (525,8 млн. дол., 2000) нафтапрадуктаў, прыроднага газу, хім. і маш.-буд. прадукцыі, харч. прадуктаў. Асн. гандл. партнёры: Расія, Узбекістан, Казахстан, Украіна, Кітай. Знешнегандлёвы абарот Т. з Рэспублікай Беларусь у 2000 склаў 5,3 млн. дол. Грашовая адзінка — самані.



Да арт. **Таджыкістан**. 1-ы Устаноўчы з'езд Саветаў Таджыкскай АССР. 1.12.1926. Душанбе.

Узброеныя сілы. Складаюцца з сухап. войск, ВПС і войск ППА. Агульная колькасць узбр. сіл больш за 10 тыс. чал. (2000). Вярх. галоўнакамандуючы — прэзідэнт. У сухап. войсках каля 8,8 тыс. чал., танкі, баявыя машыны пяхоты, бронетранспарцёры, мінамёты, гарматы і інш. У ВПС каля 700 чал.; у войсках ППА каля 1 тыс. чал., на ўзбраенні зенітныя артыл. комплексы, зенітныя пушкі і інш.

Ахова здароўя. Ажыццяўляецца на дзярж. узроўні, існуе і прыватная практыка. Сярэдняя працягласць жыцця мужчын 60,9, жанчын 67,4 года. Узровень нараджальнасці — 33,6 на 1 тыс. чал., смяротнасць — 8 на 1 тыс. чал.

Натуральны прырост 2,5% (2001). Забеспячэнне бальнічнымі ложкамі — 1 на 115 чал., урачамі — 1 на 443 чал. Дзіцячая смяротнасць — 117 на 1 тыс. нованароджаных.

Асвета. У 2001/02 навуч. г. ў Т. дзярж. агульнаадук. школ 3649, у іх 1560 тыс. вучняў, 42 недзярж. ўстановы адукацыі, у т.л. 18 ліцэяў, 17 гімназій, 7 сярэдніх агульнаадук. школ; 45 сярэдніх прафес. навуч. устаноў, у іх 23 825 навучэнцаў; 31 ВНУ розных тыпаў (84 360 студэнтаў). Буйнейшыя ВНУ: Тадж. дзярж. ун-т, с.-г., політэхн., мед. ін-ты (усе ў Душанбе), Худжандскі ін-т. У Т. 1436 б-к і 33 музеі. Найбуйнейшая б-ка — Нац. б-ка Рэспублікі Таджыкістан імя Фірдаўсі ў Душанбе; найбуйнейшыя музеі: Нац. краязнаўчы і Нац. музей старажытнасці ў Душанбе. Навук. даследаванні вядуцца ў Нац. АН.

Літаратура. Развіваецца на *таджыкскай мове*. У яе развіцці вял. ролю адыгралі фальклор і літ. традыцыі ўсх. іранцаў — продкаў таджыкаў, якія ў старадаўнія часы насялялі Сярэднюю Азію і Харасан (Усх. Іран). Першы помнік стараж. перса-тадж. пісьменнасці — *«Авеста»*. У 3—9 ст. ствараліся эпічныя паэмы, малыя формы паэзіі. Заснавальнік класічнай л-ры на тадж. мове (фарсі) *Рудакі*. Найб. плённа класічная паэзія развівалася ў 10 — пач. 12 ст. (Дакікі, эпічная паэма *Фірдаўсі* «Шахнамэ», філас. лірыка *Ібн Сіна*, *Умара Хаяма*, *Насіра Хасрова*). У 12 ст. паявілася маст. проза (творы Балхі, Захіры). Нашэсце Чынгісхана (пач. 13 ст.) амаль на стагоддзе перапыніла развіццё л-ры ў Сярэдняй Азіі. Толькі ў 14 ст. там пачало адраджацца літ. жыццё. Гуманістычныя матывы характэрны для творчасці *Саадзі*, *Хафіза*, Кемала Худжандзі, Убейда Закані. У 15 ст. іх развівалі ў сваіх творах Кашыфі, Хатыфі, А.*Джамі*. Творчая сувязь Джамі з узб. паэтам Алішэрам Наваі мела вял. значэнне для тадж. і узб. л-р. З 16 ст. тадж. л-ра пачала вылучацца з агульнай плыні персамоўнай л-ры, уступіла ў цесную сувязь з мусульм. культурай Індыі. У 16—18 ст. вядомасць набылі паэты і празаікі Хілалі Джагатаі, Мушфікі, Сайідо Насафі, М.Бедыль. У 16 ст. ўзнік асветніцкі кірунак, гал. прадстаўнік якога А.Даніш прапагандаваў рус. культуру і л-ру, сац. рэформы. Яго ідэі развівалі Саўдо, Р.Вазех, М.Хайрат. У пач. 20 ст. традыцыі асветніцтва прадаўжалі *Айні*, Т. Асіры і інш., якія праўдзіва адлюстроўвалі жыццё народа, выкрывалі ў сваіх творах сац. супярэчнасці тагачаснага грамадства.

Пачынальнікі сав. тадж. прозы — Айні (аповесць «Адзіна»; раманы «Дахунда», «Рабы»), паэзіі — М.Рахімі, А.*Лахуці* і інш. Разняволенне жанчын, усталяванне новага жыцця — тэмы творчасці Пайрава, М.Амін-задэ. У 1930-я г. ў л-ру прыйшлі маладыя паэты і празаікі Б.Азізі, Дж.*Ікрамі*, Х.Карым, Р.Джаліл; развівалася паэтычная творчасць М.*Турсун-задэ*, А.Дэхаці, М.*Міршакара*, Хабіба Юсуфі і інш. У Вял. Айч. вайну тадж. пісьменнікі ўслаўлялі гераізм чалавека, братэрства народаў (паэмы Турсун-задэ, Лахуці, вершы Міршакара, Рахімі, Дэхаці і інш.). Пасляваен. л-ра стала жанрава больш разнастайнай, паглыбіла адлюстраванне жыцця і гісторыі тадж. народа. Здабыткам л-ры сталі цыкл вершаў «Індыйская балада» і паэма «Хасан-арбакеш» Турсун-задэ, паэмы «Непакорлівы Пяндж» і «Ленін на Паміры» Міршакара, раман пра вайну «Вернасць» Ф.*Ніязі*, раманы «Абноўленая зямля» С.*Улуг-зада* і «Шураб» Джаліла. Вядомасць набылі паэзія Ф.Ансары, Бахары, М.*Канаата*, Г.Мірзо, Г.Сулейманавай, М.*Фархата*, проза Дж.Адынаева, У.Кухзода, Ф.*Мухамадзіева*, Х.Назарава, М.Хаджаева. Паявіліся і гіст. раманы Ікрамі («Дванаццаць варот Бухары»), Улуг-зада («Васе»), аповесці Р.Хадзі-задэ, драмы Г.Абдуло («Полымя свабоды»), Ансары («Прысуд маці»), Улуг-зада («Рудакі») і інш. Развіваецца літ.-знаўства і крытыка (С.Табараў, М.Шукураў, Ш.Ніязі, А.Сайфулаеў). У 1954 створаны Саюз пісьменнікаў Т. На бел. мове выдадзены анталогія «Паэты Таджыкістана» (1966), «Таджыкскія народныя казкі» (1970, 1987); кнігі апавяд. і вершаў «Дом каля крыніцы» (1984) і «Крыніцы Паміра» (1989); аповесць «Раніца нашага жыцця» (1961, пер. І.Сакалоўскі і У.Жыжэнка) і раман «Абноўленая зямля» (1973, пер. Я.Васілёнак) Улуг-зада, зб-кі апавяд. «Абавязак таварыша» Бахары (1965, пер. М.Ваданосаў), «Не адкладвай на заўтра» А.Шарыфі (1984, пер. М.Базарэвіч), вершаў і казак «Пах зямлі» У.Раджаба (1987, пер. В.Лукша і В.Макарэвіч), паэт. зб-кі «Высокае гняздо» Турсун-задэ і «Сорак косак» Сулейманавай (абодва 1982, пер. апошняга Э.Агняцвет), «Рубаі» Умара Хаяма (1989, пер. Р.Барадулін) і інш. У перыяд. друку змяшчаліся пераклады на бел. мову вершаў Айні, Ансары, Н. Бако-задэ, Канаата, С.Мамура, Міршакара, Р.Назры, Ц.Пуладзі, Раджаба, Б.Сабірава, Г.Сафіевай, Сулейманавай, Турсун-задэ, Б.Фаруха, М.Хакімавай, Д.Шарыпава; апавяданняў С.Ганіева, Г.Карыма, Мухамадзіева, Р.Сафарава, Т.Усманава, Шарыфі, А.Шукухі і інш. Паэзію і прозу перакладалі і перакладаюць А.Астрэйка, М.Аўрамчык, Г.Бураўкін, А.Бялевіч, Э.Валасевіч, В.Вярба, С.Гаўрусёў, С.Грахоўскі, Х.Жычка, М.Калачынскі, І.Калеснік, К.Кірэенка, А.Лойка, Е.Лось, П.Макаль, У.Нядзведскі, Р.Няхай, У.Паўлаў, Г.Пашкоў, П.Прыходзька, Я.Семяжон, Ю.Свірка, М.Чарняўскі, Х.Чэрня, У.Шахавец і інш.

Архітэктура. На тэр. Т. выяўлены паселішчы неалітычнай гісарскай культуры (6—5 ст. да н.э.) і эпохі бронзы са слядамі жытлаў. Ад часоў Ахеменідаў захаваліся рэшткі стараж.-бактрыйскага будынка з сырцовай цэглы (6—4 ст. да н.э., гарадзішча *Калаі-Мір*). Паводле ант. аўтараў вядома пра існаванне на тэр. Т. ў 4—3 ст. да н.э. гарадоў эліністычнага тыпу з абарончымі сценамі і рэгулярнай планіроўкай. Да грэка-бактрыйскага (3—2 ст. да н.э.) і кушанскага (1—4 ст. н.э.) часу належаць руіны гарадоў на Пд Т., якія спалучалі рысы эліністычнай буд. культуры з мясц. традыцыямі. У 5—8 ст. на тэр. Т. ўзнікалі раннесярэдневяковыя гарады з цытадэлямі і ўмацаваннямі, рэгулярна забудаванымі шахрыстанамі (Пенджыкент). Палацы з параднымі заламі і троннымі айванамі і багатыя дамы з 4-стаўповымі параднымі заламі былі ўпрыгожаны жывапісам і драўлянай разьбой. На лініі гар. сцен ці па-за горадам ставілі цыта-



Да арт. **Таджыкістан**. Мячэць-маўзалей Муслехеддзіна ў г. Худжанд. 16—17 ст.



Да арт. **Таджыкістан**. Прэзідэнцкі палац у Душанбе.



Да арт. **Таджыкістан**. На праспекце Рудакі ў Душанбе.

дэлі. У сельскай мясцовасці будавалі ўмацаваныя загарадныя сядзібы, вартоўні, замкі-кёшкі (данжоны; Уртакурган, Калаі-Муг). Адрозніваліся тыпы збудаванняў, што належалі розным веравызнанням (храмы ў Пенджыкенце, будыйскія манастыр Аджына-Тэпе і храм у крэпасці Калаі-Кафірніган). Пасля араб. заваявання і пашырэння ісламу ў архітэктуры Т. з'явіліся мячэці, маўзалеі, медрэсэ, мінарэты, ханака. Вакол шахрыстанаў і цытадэляў гарадоў узнікалі гандл.-рамесныя прыгарады (рабады). У крапасных (Калаі-Бало каля Ісфары), палацавых (Хульбук, 10—12 ст.) і мемар. збудаваннях доўга захоўваліся мясц. раннесярэдневяковыя рысы (*Ісмаіла Самані маўзалей*). Асн. буд. матэрыялы — цэгла-сырэц, пахса (бітая гліна), з 9 ст. — абпаленая гліна. У арх. дэкоры будынкаў са скляпеністакупальнымі канструкцыямі выкарыстоўваліся ўзорыстая цагляная муроўка, разная тэракота і расфарбаваны разны стука (гліняны міхраб 10—11 ст. з мячэці ў с. Ашт); у пабудовах з плоскімі перакрыццямі — мясц. драўляны ордэр, элементы якога адлюстроўвалі даісламскія вераванні, мелі расл. ўзоры, эпіграфічныя фрызы (порцік маўзалея Хазраці-бабо ў с. Чарку каля Ісфары, 12 ст.). Дасягненне тадж. манум. дойлідства 14 ст. — партал *Мухамеда Башара маўзалея*. Адно з унікальных збудаванняў — маўзалей Мір-Сеід-Хамадані ў г. Куляб (14—17 ст.), першапачаткова 3-партальны з купальнай залай, пахавальняй і разным дэкорам. У 16—17 ст. пераважалі культавыя збудаванні з Г-падобнай купальнай галерэяй (мячэць Абдула-хана ў с. Наўгілем каля Ісфары, мячэць-маўзалей Муслехеддзіна ў Худжандзе, маўзалей Махдумі Азама ў Гісары). У 18 — пач. 19 ст. традыцыі тадж. дойлідства развіваліся ў архітэктуры масавых грамадскіх будынкаў (медрэсэ ў Гісары, кварталь-ныя і сельскія мячэці, лазні) і ў нар. жыллі. Архітэктура 20 ст. прайшла шлях развіцця ад 1-павярховых глінабітных і сырцовых жытлаў, хаатычна забудаваных кішлакоў і некалькіх сяродневяковых гарадоў да добраўпарадкаваных дамоў і гарадоў, якія развіваюцца паводле генпланаў (Душанбе, Худжанд). У горадабудаўніцтве 1930—40-х г. выкарыстоўваўся прынцып перыметральнай забудовы, панавалі класіцыстычныя формы ў спалучэнні з элементамі сярэдневяковага сяроднеазіяцкага дойлідства. З 1950-х г. пачалі ствараць мікрараёны з сучаснай сістэмай абслугоўвання, са шматпавярховымі (4—5, 9 паверхаў) сейсмаўстойлівымі дамамі, каркаснапанэльныя збудаванні. Будуюцца новыя гарады Нурэк, Рэгар і г.п. Яван. У 1980—90-я г. арх. формы спалучаюць з традыц. дэкорам, арнаментальнымі і сюжэтнымі размалёўкамі, керамікай, разьбой па ганчу і дрэве, габеленам. У 1936 засн. Саюз архітэктараў Т.



Да арт. **Таджыкістан**. Скульптурная кампазіцыя «Зоркі паэзіі» ў Душанбе.



Да арт. **Таджыкістан**. Мемарыяльны комплекс да 1100-годдзя дзяржавы Саманідаў у Душанбе.

Выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Мастацтва таджыкаў развівалася як частка гіст.-культ. працэсу сяроднеазіяцкага рэгіёна і цесна звязана з мастацтвам інш. народаў (асабліва узбекаў), шэраг помнікаў з'яўляецца іх агульнай спадчынай (мініяцюры, выра-



Да арт. **Таджыкістан**. З.Хабібулаеў. Бахор (вясна). 1967.

бы дэкар.-прыкладнога мастацтва). На тэр. Т. выяўлены наскальныя размалёўкі ў гроце Шахты (15—10-е тыс. да н.э., Усх. Памір), ляпная і ганчарная ангабіраваная кераміка з геам. узорам, прасцейшыя формы ювелірных вырабаў (сярэдзіна 2 — пач. 1-га тыс. да н.э.), схематычная гліняная выява чалавека (пахавальня Тандыр-Ёл каля Рэгара, 2-е тыс. да н.э.). Ад эпохі Ахеменідаў захаваліся ювелірныя вырабы, творы мастацтва сакаў (бронз. катлы са скульпт. дэкорам, літыя фігурныя бляхі, петрогліфы). Мастацтва грэка-бактрыйскага (3—2 ст. да н.э.) і кушанскага (1—4 ст. н.э.) перыядаў спалучала мясц. традыцыі і эліністычныя элементы. Раннесярэдневяковае мастацтва Т. развівалася ў рэчышчы культур Согда, Уструшаны і Тахарыстана, у якіх фарміраваліся мясц. стылі праз спалучэнне эліністычных і кушанскіх традыцый з рысамі мастацтва Паўн. Індыі і Афганістана: скульптура (прысценныя статуі і гарэльефы, медальёны са сцэнамі барацьбы коннікаў-ваяроў, выявамі фантаст. звяроў) і жывапіс (фрэскі будыйскіх храмаў, размалёўкі палацаў Пенджыкента, Шахрыстана, Калаі-Кафірнігана). Пасля арабскага заваявання і пашырэння ісламу ў мастацтве развіваў пышны разны дэкор, які захоўваўся мясц. даісламскія выяўл. матывы, расл. ўзоры, эпіграфічныя фрызы. Паступова пачалася арнаменталізацыя ўсяго выяўл. мастацтва з перавагай расл., геам. і эпіграфічных матываў. Новы росквіт мастацтва ў 15 ст. звязаны з *герацкай школай* мініяцюры, у 16—17 ст. — з сяроднеазіяцкай школай у Бухары і Самаркандзе. Мініяцюра, верагодна, развівалася ў горным Т. (рукапіс «Юсуф і Зулейха» з Дарваза, 1797—98). У дэкар.-прыкладным мастацтве мясц. традыцыі ўзбагаціліся элементамі маст. культур інш. краін Усходу (паліваная размаляваная кераміка, ткацтва, вырабы з металу і шкла, ювелірныя). Развіваліся разьба і размалёўка па стука, дрэве, тэракоце, арнаментальная размалёўка тэмперай і шматколерная з пазалотай размалёўка «кундаль» (па

рэльефнай глінянай аснове). У 18 — пач. 20 ст. пашырыліся маст. рамёствы: кераміка з падглазурнай размалёўкай (Паўн. Т.) ці ляпная з ангобнай размалёўкай (Паўд. Т.), ювелірныя вырабы з дэкар. і складанаўзорыстымі спалучэннямі серабра і каляровых камянёў, ткацтва, набіванка, вышыўка. У 1-й пал. 20 ст. ў Т. працавалі мастакі А.Ашураў, А.Камелін, М.Новік, П.Фальбаў, М.Хашмухамедаў, Я.Чамадураў, Б.Шахназараў і інш. З 2-й пал. 20 ст. развіваюцца ўсе віды выяўл. і дэкар.-прыкладнога мастацтва ў творчасці жывапісцаў З.Давыдава, І.Лісікава, А.Рахімава, З.Хабібулаева, Х.Хушвахтава, С.Шарыпава; скульптара К.Жумагазіна; графікаў Р.Азімава, С.Вішняпольскага, С.Краснапольскага, Т.Самандарава, Б.Серабранскага, сцэнографаў М.Мухіна, М.Шыпуліна і інш. У 1938 створаны Саюз мастакоў Т.



Да арт. **Таджыкістан**. Х.Хушвахтаў. Былыя гады. 1967.



Да арт. **Таджыкістан**. А.Рахімаў. Дары маёй даліны. 1974.

Музыка. Ранніе звесткі пра музыку стараж. народаў, гістарычна звязаных з Т., адносяцца да 3—2 ст. да н.э. Музыка развівалася пераважна як аднагалосае мастацтва вуснай традыцыі, была унісоннай, дыятанічнай. Багатая і разнастайная метрарытміка песень і інстр. п'ес. Характэрны няцотныя (5/8, 7/8 і інш.) і 6-дольныя памеры. Муз. фальклор уключае прац., абрадавыя, лірычныя, эпічныя (у т.л. эпас «Гурўглі») і інш. песні, якія выконваюцца сола і ў суправаджэнні інструментаў. Складаліся своеасаблівыя спосабы спеваў: ішкамі (брушное), бінігі (насавое) і гулугі (гарлавое). Сярод нар. інструментаў: думбрак, дутар, рубаб, сетар, танбур (усе струнна-шчыпковыя), гіджак (струнна-смыкавы), най, кашнай, сурнай, карнай (духавыя), чанг (струнна-ўдарны), дойра, таўляк (ударныя), занг (званочкі), чанг-кобус (варган). Нар. танцы выконваюцца пад акампанемент нар. інструментаў ці унісоннага хору. Найб. росквіту нар.-прафес. і прафес. музыка вуснай традыцыі дасягнула ў сярэдневякоўі ў гарадах. Класічны помнік муз.-паэт. творчасці — цыкл з 6 шматчасткавых вак.-інстр. паэм «Шашмаком». Станаўленне прафес. музыкі пачалося ў 20 ст., калі былі створаны муз. тэхнікум у г. Ленінабад (1929), маст. камбінат (школа) у г. Душанбе (1934, з 1937 — муз.-балетная школа) і інш. Развіваліся шматгалосыя спевы, арк. ігра, муз.-сцэн. мастацтва, разнастайныя жанры і формы шматгалосай музыкі. Важную ролю ў станаўленні прафес. тадж. музыкі адыгралі кампазітары Д.Дустмухамедаў, Я.Сабзанаў, Ш.Сайфіддзінаў, Ф.Саліеў, З.Шахідзі, Ф.Шахобаў; музыканты і педагогі С.Баласанян, А.*Ленскі*, С.Урбах і інш. Сярод першых нац. твораў: опера «Паўстанне Васе» Баласаняна (1939), балет «Дзве ружы» Ленскага (1941), шматгалосы твор «Залаты кішлак» І.Рагальскага (1944), «Таджыкская рапсодыя» Саліева (1947), вак.-сімф. творы Дустмухамедава, Сайфіддзінава. Для 2-й пал. 20 ст. характэрна імкненне кампазітараў да ўзбагачэння муз. мовы сучаснымі сродкамі выразнасці і пераўтварэнне глыбінных фальклорных пластоў. Развіваюцца музыка да спектакляў драм. т-ра і кінафільмаў, эстр. музыка. Сярод муз. дзеячаў дырыжоры І.Абдулаеў, З.Айрапецянц, А.Камалаў, Саліеў, А.Хамдамаў; хар. дырыжор — Х.Мулакандаў; спевакі А.*Бабакулаў*, М.Бакіева, С.Бандышоева, Р.Галібава, М.Ібрагімава, Б.Ісхакава, Л.*Кабірава*, Б.Маматкулаў, Х.*Маўлянава*, Ш.Муладжанава, Дж.*Муродаў*, Б.Ніёзаў, Р.Талмасаў, Т.Фазылава; выканаўцы нар. песень М.Бахадураў, М.Назардодава, Н.Раупава, Х.Рызо; салістка балета М.Сабірава; выканаўцы на нар. інструментах Г.Гуламаліеў, А.Алаеў. Працуюць: Тадж. т-р оперы і балета (1940, Душанбе); філармонія (1938, Душанбе), у складзе якой ансамбль рубабістак (1940), сімф. аркестр (1965), ансамблі песні і танца; стр. квартэт (1978); пры Дзяржтэлерадыё аркестр нар. інструментаў, ансамбль шашмакамістаў (1964), эстр. ансамбль «Гульшан» (1966), дзіцячы хор (1982) і інш. У 1949 створаны Саюз кампазітараў Т.

Тэатр. Вытокі тэатр. дзействаў у песнях і танцах, нар. гульнях, даісламскіх культавых абрадах. На аснове нар. мастацтва складаліся нар. лялечны т-р «зачабозі» і вусны традыц. т-р масхарабозаў (выступалі на вяселлях, сямейных урачыстасцях), асабліва пашыраны ў 19 ст. У сав. час развіваўся аматарскі т-р. У 1929 у Душанбе з аматарскага гуртка створаны першы прафес. т-р — Таджыкскі драм. т-р імя А.Лахуці, у 1932 — муз.-драм. т-р у Худжандзе. У 1930-я г. прафес. т-ры з'явіліся і ў інш. гарадах і гар. пасёлках (Харог, Куляб, Ісфара, Наў і інш.). У рэпертуары т-раў п'есы С.Саідмурадава, М.Рабіева, М.Міршакара, Дж.Ікрамі, А.Сідкі, Ф.Ансары, Г.Абдуло, Ш.Кіямава і інш.; класічная і сучасная драматургія. Значны ўклад у тэатр. мастацтва зрабілі Б.Аліфбекава, Г.Бакаева, А.Бурханаў, Т.Гафарава, Г.Заўкібекаў, М.Ібрагімава, Б.Карамхудоеў, М.Касымаў, Х.Назарава, Х.Рахматулаеў, Г.Савельева, С.Туйбаева, Т.Фазылава, М.Халілаў, С.Шаісмаілава і інш.

Кіно ўзнікла ў 1929 з вытворчасці дакумент. і хранікальных фільмаў. У 1930 створана кінастудыя «Таджыкфільм». Першы маст. фільм — «Калі памірающь эміры» (1937, рэж. Л.Пячорына), першыя гукавыя маст. фільмы «Сад» (рэж. М.Досталь) і «Сябры сустракаюцца зноў» (рэж. К.Ярматаў, абодва 1939). У час вайны і першыя пасляваен. гады ствараліся толькі дакумент. карціны. У 1957 адноўлены выпуск маст. фільмаў («Дахунда» паводле Айні, рэж. Б.Кімягараў). Здымаліся фільмы на гіст. тэмы і пабудаваныя на фальклорных матывах і нар. эпасе: «Лёс паэта» (1959, рэж. Кімягараў), фільм-балет «Лейлі і Меджнун» (рэж. Т.Беразанцава, Г.Валаматзадэ), «Насрэддзін у Хаджэнце, або Зачараваны прынц» (абодва 1960, рэж. А.Бек-Назараў, Э.Карамян), «Сцяг каваля» паводле А.Фірдаўсі (1961, рэж. Кімягараў); на сучасную тэматыку: «Мой сябра Наўрузаў» (1957, рэж. Ш.Кіямаў, Н.Літус), «Высокая пасада» (1958, рэж. Кімягараў); камедыі «Я сустрэў дзяўчыну» (1957, рэж. Р.Перэльштэйн), «Сыну пара жаніцца» (1960, рэж. Т.Сабіраў) і інш. У 1960—70-я г. пошук новых тэм, жанраў, выяўл. сродкаў характэрны для маладых рэжысёраў М.Арыпава («Нісо»,1966; «Тайна продкаў», 1972), М.Касымавай («Лета 1943», 1968; «Джура Саркор», 1970), С.Хамідава («Сустрэча ў старой мячэці», 1969; «Легенда турмы Павіяк», 1971), А.Тураева («Трэцяя дачка», 1971) і інш. Маральныя праблемы ўздымаліся ў фільмах «Пад попелам агонь» (1967, рэж. Рахімаў), «Як

патрабуе сэрца» (1968) і «Аднаго жыцця мала» (1975, рэж. Кімягараў). Экранізаваўся нац. эпас: «Сказанне пра Рустама» (1971), «Рустам і Сухраб» (1972), «Сказанне пра Сіявуша» (1977, рэж. усіх Кімягараў). У 1960—80-я г. кіно для дзяцей здымалі рэжысёры В.Ахадаў, Б.Арабаў, Касымава; сярод рэжысёраў-дакументалістаў В.Кузін, В.Фамін, Г.Артыкаў, Е.Кімягарава, М.Мансурхаджаеў, М.Юсупава і інш. У 1980-я г. кіно Т. папоўнілася стужкамі рэжысёраў Д.Худаназарава, Ю.Юсупава, А.Тулаева і інш. У 1990-я г. ў сувязі з грамадзянскай вайной фільмаў стваралася мала. Шэраг рэжысёраў выехалі з краіны. Сярод фільмаў 1990-х — 2000 г.: «Кош ба кош» (1993, прыз Міжнар. кінафестывалю ў Венецыі «Сярэбраны леў»), «Месячны тата» (1999, Гран-пры расійскага кінафестывалю «Кінатаўр», рэж. абодвух Худаназараў), «Прысутнасць» (1995, рэж. Т.Хамідаў), «Палёт пчалы» (1998), «Крыніца» (2000), «Анёл правага пляча» (2002, рэж. усіх Дж.Усмонаў) і інш. Сярод папулярных акцёраў кіно Т.: М.Арыпаў, С.Азаматава, Х.Абдуразакаў, М.Касымаў, С.Туйбаева і інш. У 1962 створаны Саюз кінематаграфістаў Т.

Літ.: История таджикского народа. Т. 1—3. М., 1963—65; Актуальные проблемы истории таджикского народа. Душанбе, 1988; Гафуров Б.Г. Таджики: Древнейшая, древняя и средневековая история. М., 1972; История Таджикской ССР. Душанбе, 1983; Масов Р.М. История исторической науки и историография социалистического строительства в Таджикистане. Душанбе, 1988; История таджикского народа. Т. 1—2. Душанбе, 1998—99; Очерки истории таджикской советской литературы. М., 1961; История советской многонациональной литературы. Т. 1—6. М., 1970—74; История музыки народов СССР. Т. 1—5. М., 1970—74; Музыкальная жизнь Советского Таджикистана. Вып. 1—2. Душанбе, 1974—75; Нурджанов Н.Х. Таджикский театр: Очерк истории. М., 1968; Ахроров А., Азизова С. Кино Таджикистана. М., 1982; Огонек. 2001. Спец. вып.

П.І.Рогач (прырода, насельніцтва, гаспадарка), *В.У.Адзярыха* (гісторыя), *М.М.Валачко* (узброеныя сілы), *І.М.Ключановіч* (літаратура), *Я.Ф.Шунейка (*архітэктура, выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва), *А.П.Бабкова* (кіно).

ТАДЖЫ́КСКАЯ МО́ВА, адна з *іранскіх моў* (наўд.-зах. група). Мова *таджыкаў*, афіц. мова *Таджыкістана*. Пашырана ва Узбекістане, Афганістане, Іране, часткова ў Кіргізіі і Казахстане. Мае дыялектныя групы: паўн. (гаворкі Бухары і Самарканда, Ферганскай даліны, Ура-Цюбе, Пенджыкента і інш.), цэнтр. (верхнезераўшанская), паўд. (каратэгінскія, кулябскія, рогскія і бадахшанскія), паўд.-ўсх. (дарвазская). У сучаснай літ. Т.м. 6 галосных, 24 зычныя; націск дынамічны, пераважна на апошнім складзе. Паводле грамат. ладу належыць да *аналітычных моў*. Літ. Т.м. ўзыходзіць да класічнай персідска-таджыкскай мовы (9—15 ст.) — адзінай крыніцы для тых, хто гаворыць на персідскім, таджыкскім і афганскім дары. Першыя пісьмовыя



помнікі на арабскай графіцы. Пісьменства Т.м. ў Таджыкістане на аснове *кірыліцы*.

Літ.: Соколова В.С. Фонетика таджикского языка. М.; Л., 1949; Расторгуева В.С. Опыт сравнительного изучения таджикских говоров. М., 1964; Ефимов В.А. Расторгуева В.С., Шарова Е.Н. Персидский, таджикский, дари // Основы иранского языкознания: Новоиран. языки. М., 1982.

ТАДЖЫ́НСКАЯ КАТЛАВІ́НА, Таджынская ўпадзіна, міжгорная катлавіна ў Рэспубліцы Тыва, у Расіі. Размешчана ў гарах Паўд. Сібіры, паміж Усх. Саянам і хр. Акадэміка Обручава, даўж. 150 км, выш. ад 800 м на З да 1800 м на У. Рэльеф месцамі сярэднягорны, на З — узгорыста-раўнінны. Ёсць значныя азёры (Таджа, Маны-Холь, Кадыш-Холь). Пераважаюць таежныя лясы з лістоўніцы, кедру, елкі, хвоі; на З месцамі ўчасткі стэпаў.

ТАЁЖНАЯ ЗО́НА, біяземальная лясная зона, прыродная геагр. зона, у ландшафтах якой пераважае *тайга*. Часам разглядаецца як падзона ў складзе адзінай *лясной зоны* ўмеранага пояса Паўн. паўшар'я. Размешчана паміж *лесатундравай зонай* (на Пн) і *мяшаных лясоў зонай* і *лесастэпавай зонай* (на Пд); працягваецца з З на У прыблізна на 9 тыс. км пераважна ў Еўразіі, таксама ў Паўн. Амерыцы. На У Еўразіі ўздзеянне халоднага зімовага мусону садзейнічае далёкаму пранікненню тайгі на Пд. Клімат ад акіянічнага да рэзка кантынент., з халоднай (ад -10 °С да -20 °С, у Паўн.-Усх. Сібіры да -50 °С і ніжэй) снежнай зімой і параўнальна цёплым (10—20 °С) вільготным летам. Колькасць ападкаў 300—600 мм за год, пераважае выпаральнасць, што спрыяе інтэнсіўнай забалочанасці тэрыторыі і мнагаводнасці рэк. На значнай ч. Сібіры пашырана шматгадовая мерзлата, што адмоўна адбіваецца на расл. і глебавым покрыве. Пераважаюць бедныя ў відавым складзе цемнахвойныя (з елкі і піхты) і светлахвойныя (пераважна з



Таемнік лускаваты.

лістоўніцы) лясы, з дамешкам драбналістых парод на падзолістых і мярзлотна-таежных глебах. Прысутнічае моховае покрыва, кусцікавы ярус. У гарах таежныя ландшафты ўтвараюць самаст. вышынны пояс. У Т.з. развіта лясная гаспадарка, паляўнічы промысел, па далінах рэк пашы, сенакосы. У Зах. Сібіры — радовішчы нафты і газу.

В.С.Аношка.

ТАЕ́МНІК (Lathraea), род кветкавых раслін сям. залозніковых. 7 відаў. Пашыраны ва ўмеранай вобласці Еўразіі. На Беларусі 1 від — Т. лускаваты (L. squamaria), нар. назвы грымотнік, цар-трава, вясёлка. Трапляецца вясной у лісцевых і мяшаных лясах, хмызняках, паразітуе пераважна на каранях лящчыны.

Шматгадовыя бесхларафільныя расліны, якія паразітуюць на каранях дрэў і кустоў. Карэнішчы крыжападобна разгалінаваныя, мясістыя, сакаўныя. Сцёблы малінава-ружаватыя, выш. да 25 см, летам адміраюць. Лісце супраціўнае, лускаватае, лілова-ружаватае. Кветкі невял., малінава-чырв., у аднабокім верхавінкавым суквецці. Плод — каробачка.

А.М.Скуратовіч.

ТАЁН, тытул князька — правадыра асобнага племя ў якутаў да 17 ст. Пасля далучэння Сібіры да Расіі Т. сталі апорай рас. адміністрацыі. У 2-й пал. 19 ст. з Т. фарміравалася якуцкая гандл. буржуазія.

ТАЁНА́КА, горад у Японіі, на Пд в-ва Хонсю, прамысл. прыгарад г. Осака. Каля 500 тыс. ж. (2001). Чыг. ст., вузел аўтадарог. Прам-сць: чорная металургія, нафтахім., трансп. машынабудаванне.

«ТАЁТА», сям'я аўтамабіляў і аўтобусаў яп. канцэрна «Таёта мотар карпарэйшэн». Выпускаюцца з 1935. Легкавыя аўтамабілі маюць кузаў седан, хэтчбэк ці купэ, рухавік магутнасцю 54—243 кВт, найб. скорасць да 250 км/гадз; грузавыя аўтамабілі агульнага прызначэння — поўную масу 1,99—4,5 т, рухавік магутнасцю 51—88 кВт. Аўтобусы ўмяшчаюць да 26 пасажыраў.


1


2


3


4

Сям'я аўтамабіляў **«Таёта»**: 1 — купэ мадэлі «Цэліка»; 2 — пікап «Т-100»; 3 — мікрааўтобус «ХайЭйс»; 4 — грузавы аўтамабіль «Дына-350».

«ТАЁТА МО́ТАР», найбольшая аўтамабільная кампанія ў Японіі. Засн. ў 1926 як «Таёда атаматык лум воркс», з 1937 — сучасная назва. Вырабляе легкавыя і грузавыя аўтамабілі, аўтобусы, аўтапагрузчыкі, трактары, дэталі і вузлы да машын, змазачныя маслы, быт. эл. тавары. Паводле аб'ёму продаж займае ў Японіі 1-е месца, у свеце сярод буйнейшых кампаній — 18-е, сярод галіновых — 3-е. Мае 10 вытв. прадпрыемстваў у Японіі, 27 — у інш. краінах. Супрацоўнічае з аўтамаб. кампаніямі ЗША (кааперуецца з «Джэнерал мотарс карпарэйшэн») і Вялікабрытаніі.

ТАЁТО́МІ Хідэёсі (1536 — 15.9.1598), японскі палкаводзец і дзярж. дзеяч. Напачатку паплечнік палкаводца Н.Ода ў войнах за аб'яднанне Японіі. Пасля смерці Ода ў 1582 сканцэнтраваў у сваіх руках усю дзярж. ўладу, застаючыся фармальна канцлерам (кампаку). Завяршыў аб'яднанне Японіі, падпарадкаваўшы ў 1587 в-аў Кюсю, у 1590 — паўн.-ўсх. ч. в-ва Хонсю. Рабіў захады па замацаванні прывілеяванага становішча самураяў. Правёў шэраг мерапрыемстваў па рэстаўрацыі прыгонніцтва. Праводзіў агрэсіўную знешнюю палітыку, вёў вайну супраць Карэі, але пацярпеў паражэнне (гл. *Імдзінская вайна 1592—98)*.

Літ.: Искендеров А.А. Тоётоми Хидэёси. М., 1984.

ТАЁХАСІ, горад у Японіі, на ПдУ в-ва Хонсю. Каля 350 тыс. ж. (2001). Трансп. вузел. Прам-сць: шаўковая, маш.-буд., хім., дрэваапрацоўчая.

ТА́ЗАЎСКІ ПАЎВО́СТРАЎ, на Пн Зах.-Сібірскай раўніны, у Ямала-Ненецкай аўт. акрузе Расіі. Абмываецца на З Обскай, на У Тазаўскай губамі Карскага м. Даўж. каля 200 км, шыр. каля 100 км, выш. каля 100 м. Паверхня раўнінная, слаба нахіленая да Тазаўскай губы, стромка абрываецца да Обскай губы. Тундравая расліннасць.

ТАІ́ДЗЕ, грузінскія мастакі; бацька і сын. Нарадзіліся ў Тбілісі.

Майсей (Масе) Іванавіч (2.2.1871 — 17.6.1953), жывапісец. Нар. маст. СССР (1953). Правадз. чл. АМ СССР (1947). Герой Працы (1932). Праф. Тбіліскай АМ (1930—53). У 1922 арганізаваў у Тбілісі Нар. маст. студыю. Аўтар твораў, прысвечаных нар. побыту, гісторыі Грузіі, партрэтаў: «Мцхетоба» (1899—1901), «Партрэт маці» (1904—05), «Ліст з фронту» (1942), «Песня перамогі» (1948).

Іраклій Майсеевіч (27.3.1902 — 1985), графік, жывапісец. Засл. дз. маст. Расіі (1951). Нар. маст. Грузіі (1980). Вучыўся ў свайго бацькі Майсея Т. Скончыў Тбіліскую АМ (1930). Аўтар плакатаў, якім уласцівы эмацыянальнасць, прызыўныя сіла («Радзіма-Маці заве!», 1941), ілюстрацый да паэмы Шата Руставелі «Віцязь у тыгравай шкуры» (1937) і кнігі «Гісторыя Грузіі» (1950), жывапісных карцін. Дзярж. прэміі СССР 1941, 1948, 1949, 1951.



І.**Таідзе**. Радзіма-Маці заве! 1941.

ТАІ́З, горад на ПдЗ Йемена. Адзін са стараж. араб. гарадоў. Каля 300 тыс. ж. (2001). Гандл.-трансп. цэнтр. Міжнар. аэрапорт. Вытв-сць посуду, вырабаў з пластмас і алюмінію, харч. прадуктаў. Рамёствы. Мячэці аль-Музафар (13—14 ст.; рэстаўрыравана ў 17—18 ст.), аль-Ашрафія (13 ст.); гарадская сцяна з 2 варотамі і цытадэллю. Паблізу мячэць Джанадыя (7 ст.).

ТА́ІНСТВЫ, у хрысціянстве абрадавыя дзеянні, у якіх «пад бачным абразом паведамляецца вернікам нябачная боская ласка». Праваслаўе і каталіцызм прызнаюць Т. *хрышчэння, прычасця*, свяшчэнства, *споведзі*, мірапамазання, шлюбу, ялееасвячэння (саборавання). У большасці пратэстанцкіх плыней спраўляюцца толькі хрышчэнне і прычасце, якія разглядаюцца як сімвалічныя абрады, што не адрозніваюцца ад іншых. Паводле вучэння царквы, Т. ўстаноўлены Ісусам Хрыстом. Яны ў хрысціянскі культ уводзіліся на працягу доўгага часу. Спачатку хрышчэнне і прычасце, потым свяшчэнства і толькі ў 4—5 ст. — астатнія Т. Вытокі Т. узыходзяць да вераванняў, магічных дзеянняў стараж. людзей, якія былі ўпэўнены ў магчымасці непасрэдных зносін са звышнатуральнымі сіламі, уздзеяння на іх. Пры ўстанаўленні Т. хрысціянства запазычыла шмат элементаў з усх. рэлігій. Вял. ўвагу царква аддае правільнаму выкананню Т. з абавязковым удзелам у іх духоўных асоб, чым падкрэсліваецца роля царквы як пасрэдніцы паміж Богам і людзьмі. Гэта ўмова не прызнаецца пратэстанцкімі цэрквамі, якія адмаўляюць ідэю пасрэдніцтва царквы ў зносінах чалавека з Богам.

ТАІ́РАЎ (сапр. Корнбліт) Аляксандр Якаўлевіч (6.7.1885, г. Рамны Сумскай вобл., Украіна — 25.9.1950), расійскі рэжысёр. Нар. арт. Расіі (1935). Творчую дзейнасць пачаў у 1905 як акцёр, з 1908 — рэжысёр. Заснавальнік (сумесна з А.Коанен) і маст. кіраўнік Камернага т-ра (1914—49) у Маскве. Адзін з рэфарматараў рус. сцэны. Імкнуўся да стварэння «сінтэтычнага т-ра» — пераважна рамант. і трагедыйнага рэпертуару, выхавання ў акцёраў віртуознага майстэрства, пераўтварэння сцэн. прасторы. Сярод пастановак: «Фаміра-кіфарэд» І.Аненскага (1916), «Саламея» О.Уайльда (1917), «Прынцэса Брамбіла» паводле Э.Т.А.Гофмана (1920), «Федра» Ж.Расіна (1922), «Каханне пад вязамі» Ю.О'Ніла (1926), «Аптымістычная трагедыя» У.Вішнеўскага (1933), «Мадам Бавары» паводле Г.Флабера (1940) і інш.

ТАІ́ЦІ (Tahiti), вулканічны востраў у Ціхім ак., самы вялікі ў групе астравоў Таварыства, у складзе *Палінезіі Французскай*, уладанне Францыі. Пл. 1042 км^2. Нас. каля 140 тыс. чал. (2000). Складa-

ецца з 2 горных масіваў, злучаных вузкім (да 2 км) перашыйкам. Выш. да 2241 м (г. Арахена). Абкружаны каралавымі рыфамі. Клімат трапічны марскі. Ападкаў 1400 мм за год. Вільготныя трапічныя лясы. На берагавой нізіне плантацыі какосавых пальмаў, бананаў, цукр. трыснягу, ванілі, ананасаў. Вырошчваюць тара, ямс, батат, маніёк і інш. Здабыча жэмчугу. Рыбалоўства. Турызм. На Т. адм. цэнтр і асн. порт Палінезіі Франц. — Папеэтэ.

ТАЙБЭ́Й, горад у Кітаі, на Пн в-ва *Тайвань*. Найбуйнейшы горад, адм. цэнтр прав. *Тайвань*. 7,7 млн. чал. з прыгарадамі (2000). Вузел чыгунак і аўтадарог. 2 міжнар. аэрапорты; марскі аванпорт — *Цзілун* (утварае з Т. адзіны прамысл. комплекс). Буйны прамысл. цэнтр. Прам-сць: маш.-буд., у т.л. суднабуд., радыёэлектронная (вытв-сць камп'ютэраў, тэлевізараў, магнітафонаў); металургічная, хім., цэм., дрэваапр., папяровая, лёгкая, харчовая. Ун-ты, навук. ўстановы, музеі.

У пач. 18 ст. на тэр. сучаснага Т. існавалі 3 паселішчы, якія ў сярэдзіне 19 ст. ператварыліся ў гандл. цэнтр. З 1875 горад. Пасля ўтварэння асобнай прав. Тайвань — рэзідэнцыя губернатара, з 1891 — сталіца правінцыі. У час яп. калан. панавання (1895—1945) у Т., перайменаваным у Тайхоку, знаходзілася рэзідэнцыя яп. губернатара. Пасля аднаўлення кіт. суверэнітэту над Тайванем (1945) — цэнтр яго правінцыі. З 1949 у Т. размясціўся ўрад Кіт. Рэспублікі (пасля паражэння ў грамадз. вайне з кіт. камуністамі ў мацерыковым Кітаі), у 1958 афіцыйна абвешчаны месцам яго знаходжання. У 1967 вылучаны ў асобны адм. раён пад кіраваннем цэнтр. ўрада.

В.У.Адзярыха (гісторыя).

ТАЙВА́НЬ, Фармоза, востраў у Ціхім ак., каля ўсх. берагоў мацерыковага Кітая, ад якога аддзелены *Тайваньскім пралівам*. Выцягнуты з Пн на Пд на 394 км, шыр. да 140 км, пл. каля 36 тыс. км^2. Уздоўж усх. берага *Тайваньскія горы* (выш. да 3997 м), на Пн — група патухлых вулканаў, на З — прыбярэжная раўніна. Частыя землетрасенні. Карысныя выкапні: каменны вугаль, гаручы газ, нафта, золата. Клімат на Пн субтрапічны, на Пд трапічны мусонны. Т-ра паветра ў студз. 15—20 °С, у ліп. 25—30 °С. Ападкаў на раўнінах 1500—2500 мм за год у гарах месцамі больш за 5000 мм. У жн. і верасні частыя тайфуны. Больш за 50% тэр. займаюць горныя лясы (больш за 3000 відаў, у т.л. больш за 1500 эндэмічных). У ніжняй ч. схілаў — вільготныя вечназялёныя лясы з пандануса, пальмаў, бамбукаў, ліян; вышэй — шыракалістыя лістападныя і мяшаныя лясы з камфарнага лаўру, кіпарысу, елкі, піхты, дрэвападобных папарацяў, псеўдатсугі і інш. Вышэй 3300 м хмызнякі з рададэндрану і горныя лугі. Раўніны і нізіны асвоены. Пра насельніцтва і гаспадарку гл. ў арт. *Тайвань* (правінцыя Кітая).

ТАЙВА́НЬ, правінцыя Кітая. Займае в-аў *Тайвань* і прылеглыя дробныя а-вы, у т.л. *Пэнхуледао*. Пл. каля 36,1 тыс. км^2. Нас. 22,1 млн. чал. (2000). Адм. ц. — г. *Тайбэй*. Кітайцы складаюць 98%, карэнныя жыхары (народ гаашань) — каля 2%. Вернікі — будысты, даасісты, канфуцыянцы (разам 93%), хрысціяне (5%). Сярэдняя шчыльн. 612 чал. на 1 км^2. У гарадах жыве 75% насельніцтва. У прам-сці занята 38% працаздольных, у сельскай гаспадарцы — 10%, у абслуговых галінах — 52%. Т. — магутны прамысл. рэгіён Усх. Азіі. Валавы ўнутр. прадукт у 1998 склаў 362 млрд. дол., каля 16,5 тыс. дол. на 1 чал. Развіта арацоўчая прам-сць экспартнага кірунку: радыёэлектроніка, прылада- і суднабудаванне, хім., нафтахім., тэкст., гарбарна-абутковая, швейная, харчовая; выплаўка сталі і каляровых металаў. Вытв-сць электраэнергіі 133,6 млрд. кВт · гадз (1998). Лесанарыхтоўкі. Т. — буйнейшы ў свеце вытворца і экспарцёр камфары. Апрацоўваецца 24% тэр., гал. чынам на З. Больш за 50% пл. пад рысам (2 ураджаі за год, каля 3 млн. т). Вырошчваюць цукр. трыснёг, батат, трапічныя фрукты (ананасы, бананы, мандарыны), чай, агародніну. Свінагадоўля (каля 4 млн. галоў) і птушкагадоўля. Рыбалоўства (1,04 млн. т, 1997). Транспарт чыг., аўтамаб., марскі. 13 аэрапортаў. Гал. марскія парты *Цзілун* і *Гаасюн*. У 1997 экспарт склаў 122,1 млрд. дол., імпарт — 114,4 млрд. дол. Гал. гандл. партнёры ЗША, Японія. Даход ад турызму ў 1997 склаў 3,57 млрд. дол. Грашовая адзінка — новы тайваньскі долар.

У старажытнасці в-аў Тайвань быў населены плямёнамі гаашань. У 230 адбылася 1-я ваен. экспедыцыя кітайцаў на востраў. У 13 ст. ён афіцыйна далучаны да Кітая. З 14 ст. пачалася яго каланізацыя кітайцамі. У 1590 на в-аў Т. праніклі партугальцы, якія назвалі яго Фармоза (Цудоўны). У 1624 яго захапілі галандцы, якіх у 1661—62 выгналі атрады кіт. патрыёта Чжэн Чэнгуна. Апошні ператварыў востраў у базу супраціўлення маньчжурам, якія да таго часу захапілі мацерыковы Кітай. У 1683 на востраве ўсталявалася ўлада маньчжурскай дынастыі Цын. У 1886 створана асобная кіт. правінцыя Т. У выніку *япона-кітайскай вайны 1894—95* і паводле *Сіманасекскага дагавора 1895* в-аў Тайвань з прылеглымі астравамі адышоў да Японіі. У час яп. панавання (1895—1945) Т. ператвораны ў с.-г. прыдатак Японіі. У выніку паражэння Японіі ў 2-й сусв. вайне Т. вернуты Кітаю. Пасля паражэння ад сіл кампартыі ў *трэцяй грамадзянскай вайне ў Кітаі 1946—49* на Т. знайшоў прытулак урад Кіт. Рэспублікі на čале з Чан Кайшы, рэшткі яго арміі, кіраўніцтва Гаміньдана (ГМД) і іх сем'і — больш за 2 млн. чал. (пры насельніцтве Т. 6 млн. чал.). У 1950-я г. ўрад ГМД правёў агр. рэформу, а з пач. 1960-х г. пачаў лібералізацыю эканомікі, у выніку да 1990-х г. Т. дасягнуў узроўню развіцця новых індустр. краін Азіі. У 1987 скасавана надзвычайнае становішча ў Т. і пачалася дэмакратызацыя яго паліт. жыцця. У 1996 адбыліся 1-я ўсеагульныя выбары прэзідэнта Кіт. Рэспублікі, на якіх перамог лідэр ГМД Лі Дэнхуэй. На выбарах 2000 перамог кіраўнік Дэмакр. прагрэс. партыі Чэнь Шуйбянь, што скончыла манаполію ГМД на ўладу. Кіраўніцтва Кіт. Нар. Рэспублікі і ААН лічаць Т. неад'емнай ч. Кітая.

Літ.: Ларин А.Г. Два президента, или Путь Тайваня к демократии. М., 2000; История Китая. 2 изд. М., 2002.

ТАЙВА́ньСКІ ПРАЛІ́Ў, Тайваньхайся, Фармозскі праліў. Паміж усх. берагам мацерыка Азія і в-вам Тайвань. Злучае Паўд.-Кітайскае і Усх.-Кітайскае моры. Даўж. 398 км, найменшая шыр. 139 км, найменшая глыб. на фарватэры 8,6 м. Мацерыковы бераг парэзаны залівамі, шмат астравоў. У Т.п. а-вы Пэнхуледао. Цячэнне зімой накіравана на Пд, летам на Пн; скорасць 1 км/гадз. Моцныя прыліўныя цячэнні. Парты: Гаасюн, Фучжоў і Сямынь (Кітай).

ТАЙВА́ньСКІЯ ГО́РЫ. На в-ве *Тайвань*. Даўж. 270 км, шыр. да 80 км. Складзены з вулканічных, крышт. і вапняковых парод. 4 паралельныя хрыбты, падзеленыя падоўжнымі далінамі. Выш. да 3997 м (г. Юйшань). На У стромка абрывающца да мора. Грабнявая зона мае альпійскі рэльеф, сляды стараж. зледзянення. На Пн патухлыя вулканы. Тэрмальныя крыніцы. На ніжніх схілах вільготныя субэкватарыяльныя лясы, вышэй — шыракалістыя і хвойныя лясы, якія мяжуюць з зарасніками хмызняку і лугам.

ТАЙГА́ (цюрк.), занальны тып ландшафту з перавагай у расліннасці хвойных лясоў. Пашырана ва ўмераным поясе Еўразіі і Паўн. Амерыкі, а таксама ў горных раёнах Еўропы, Цянь-Шаня, Зах. Кітая, Ціхаакіянскіх узбярэжжаў Паўн. Амерыкі. Адрозніваюць Т. цемнахвойную (елкá, піхта), светлахвойную (хвоя, кедр, лістоўніца); паўн., сярэднюю, паўд. і горную. Падлесак разрэджаны (рабіна, вольха). Травяніста-кусцікавы ярус і моховае покрыва (чарніцы, брусніцы, кісліца, лясныя асокі, вейнікі, зял. імхі, лішайнікі). У фауне пераважаюць грызуны, насякомаедныя, пашыраны драпежнікі, капытныя, зайцападобныя, трапляюцца буры мядзведзь, лось, ізюбр, расамаха, рысь, каланок, собаль, выдра, белка і інш. Т. — крыніца драўніннай сыравіны для цэлюлознай і лесахім. прам-сці, буд. драўніны. *В.С.Аношка.*

ТАЙЛА́НД, Каралеўства Тайланд (на мове таі Пратэт-Таі), дзяржава ў Паўд.-Усх. Азіі, на п-ве Індакітай і паўн. ч. п-ва Малака. Мяжуе на Пн з М'янмай, на ПнУ і У з Лаосам, на ПдУ з Камбоджай, на Пд з Малайзіяй; абмываецца Андаманскім м. і Сіямскім зал. Паўд.-Кіт. мора. Пл. 514 тыс. км^2. Нас. 61,2 млн. чал. (2000). Дзярж. мова — таі (тайская, сіямская); выкарыстоўваюцца англ. і кіт. мовы. Дзярж. рэлігія — будызм. Сталіца — г. *Бангкок*. Падзяляецца на 76 чангватаў (правінцый). Нац. свята — Дзень нараджэння караля (5 снеж.).

Дзяржаўны лад. Т. — канстытуцыйная манархія. Дзейнічае канстытуцыя 1977. Кіраўнік дзяржавы — кароль. Пры каралю маецца Тайны савет. Вы-

шэйшы заканад. орган — двухпалатная Нац. асамблея, якая складаецца з палаты прадстаўнікоў (500 дэпутатаў) і сената (200 дэпутатаў). Выканаўчую ўладу ажыццяўляе ўрад на чале з прэм'ер-міністрам, якога зацвярджае кароль па прадстаўленні Нац. асамблеі. Як правіла, урад фарміруецца на аснове шматпартыйнай кааліцыі, што мае большасць у парламенце.

Прырода. Больш за палавіну тэр. Т. займаюць нізінныя раўніны, у т.л. *Менамская нізіна*. У паўд., звужанай ч. Т. — раўніны з астраўнымі гарамі і кражамі. На У плато *Карат*. На Пн і З горы Кхунтхан, Танентаўнджы і інш. Найб. выш. 2576 м (г. Інтханон). Карысныя выкапні: алавяныя, вальфрамавыя, свінцовыя, цынкавыя, магніевыя, жал. руды, нафта, прыродны газ, буры вугаль, калійныя солі, каштоўныя камяні. Клімат трапічны мусонны. Сярэднія т-ры на раўнінах 22—29 °С, на п-ве Малака 27—29 °С, у гарах на Пн зімой да 10—15 °С. Ападкаў ад 1000—2000 мм на раўнінах да 5000 мм у гарах за год; сухі сезон з ліст. да красавіка. Рачная сетка густая, рэкі паўнаводныя, бываюць паводкі. Гал. рэкі Менам-Чао-Прая і Меконг (на мяжы з Лаосам). Пад лесам каля 26% тэр. Пераважаюць лістападныя трапічныя лясы, у больш вільготных раёнах — вечназялёныя трапічныя лясы, на плато Карат — саванны, ксерафітныя рэдкалессі і хмызнякі. У складзе жывёльнага свету слон, насарог, тыгр, тапір, малпы (гібоны, макакі), дзікія быкі і інш., шмат паўзуноў. Нац. паркі Тхунгсалэнглуанг (уключаны ЮНЕСКА у спіс *Сусветнай спадчыны*), Кхаўяй і інш.; запаведнікі.

Насельніцтва. Большасць насельніцтва складаюць тайскія народы — тайцы (75%) і лао (5%), жывуць таксама кітайцы (14%), малайцы, тын, мео, яо і інш. плямёны і народнасці. Сярод вернікаў пераважаюць будысты (95%), ёсць мусульмане (3,8%), хрысціяне (0,5%) і інш. Горныя народы (карэны, семангі і інш.) — анімісты. З сярэдзіны 1980-х г. у Т. жыве каля 380 тыс. бежанцаў з Камбоджы, М'янмы, В'етнама і Лаоса. Сярэднегадавы прырост 0,93%. Сярэдняя шчыльн. 119 чал. на 1 км^2. Насельніцтва сканцэнтравана ў дэльце р. Менам-Чао-Прая (пераважна ў Бангкоку), уздоўж рэк і па зах. узбярэжжы, дзе размешчаны волаваздабыўныя прадпрыемствы. У гарадах жыве 24% насельніцтва (1998). Найб. гарады (тыс. ж., 2000): Бангкок (7200), Тханбуры (261,3), Чыянгмай (170,4). У сельскай гаспадарцы занята 54% эканамічна актыўнага насельніцтва, у прам-сці — 15%; у абслуговых галінах — 31%.

Гісторыя. Тэр. Т. заселена чалавекам з часоў палеаліту. Першыя дзярж. ўтварэнні ўзніклі ў 4—8 ст. у плямён мон-кхмераў. З канца 1-га тыс. н.э. пачалася міграцыя на тэр. Т. з Паўд. Кітая тайскіх плямён, якія да 11—12 ст. сталі тут найбуйнейшым этнасам і стварылі некалькі княстваў, што былі ў васальнай залежнасці ад кхмераў. У 1238 тайскія княствы нанеслі паражэнне кхмерам і аб'ядналіся ў дзяржаву Сукатаі. У 14 ст. Сукатаі распалася і пачалося ўзвышэнне дзяржавы Сіям (Аютыя). У 15—17 ст. у выніку войнаў з суседзямі Сіям павялічыў сваю тэрыторыю і да канца 18 ст. стаў найбуйнейшай дзяржавай Індакітая, якая побач з уласна тайскімі землямі ўключала ч. тэр. Лаоса і Камбоджы. З 16 ст. Т. — аб'ект калан. экспансіі еўрапейцаў, асабліва французаў. У 1688 нар. рух прывёў да выгнання еўрапейцаў і «закрыцця» для іх краіны. У 1782 да ўлады прыйшла дынастыя Чакры, прадстаўнікі якой і сёння кіруюць Т. У 19 ст. Сіям стаў «буферам» паміж калан. ўладаннямі Вялікабрытаніі і Францыі, якія навязвалі яму нераўнапраўныя дагаворы. Але Сіям захаваў незалежнасць дзякуючы палітыцы караля Чулалангкорна [Рамы V, 1868—1910], які мадэрнізаваў краіну на еўрап. ўзор і выкарыстоўваў супярэчнасці паміж калан. дзяржавамі. У 1904—36 Сіям дамогся скасавання нераўнапраўных дагавораў.



Герб і сцяг **Тайланда**.



У выніку дзярж. перавароту 24.6.1932 у краіне ўсталявалася канстытуцыйная манархія, у 1939 перайменавана ў Т. У снеж. 1941 на тэр. Т. ўвайшлі яп. войскі, і ён уступіў у 2-ю сусв. вайну на баку Японіі і Германіі. Уздым вызв. руху ў 1944 прывёў да змены ўрада Т. і пераходу яго на бок саюзных дзяржаў. У 1946 каралём Т. стаў *Пуміпон Адульядэт* (Рама IX), з імем якога звязаны пасляваен. пераўтварэнні. Да сярэдзіны 1970-х г. у знешняй палітыцы Т. арыентаваўся на ЗША; далучыўся да ваен. блока СЕАТО, удзельнічаў у агрэсіі ЗША у Індакітаі, дазволіўшы ім размясціць ваен. базы на сваёй тэрыторыі. У 1976 Т. дамогся вываду амер. ваен. баз, у 1977 выйшаў з СЕАТО. Выкарыстоўваючы значны прыток інвестыцый з ЗША, улады Т. ў 1950—70-я г. ажыццяўлялі палітыку індустрыялізацыі пры моцным дзярж. кантролі. У 1980—90-я г. праведзены структурныя рэформы: лібералізацыя эканомікі, прыярытэтнае развіццё дробнай і сярэдняй прам-сці, інтэнсіфікацыя агр. вытв-сці, пераарыентацыя краіны на экспартную вытв-сць, што прывяло да паскарэння эканам. развіцця і ўваходжання Т. ў кола новых індустр. краін. Паліт. развіццё краіны да 1970-х г. характарызавалася частымі ваен. пераваротамі, рэальная ўлада была ў руках ваенных. З 1980-х г. у Т. дзейнічае грамадз. рэжым, адбываецца фарміраванне дэмакр. інстытутаў. Т. — член ААН (з 1946), АСЕАН (з 1967), Руху недалучэння (з 1993). У Т. дзейнічаюць паліт. партыі: Партыя новай надзеі, Дэмакр. партыя, Нац. партыя і інш. Дыпламат. адносіны паміж Т. і Рэспублікай Беларусь устаноўлены ў ліп. 1992.

Гаспадарка. Т. — аграрная краіна з прам-сцю, якая інтэнсіўна развіваецца. Рост валавога ўнутр. прадукту (ВУП) у апошняе дзесяцігоддзе перавышае рост колькасці насельніцтва. Штогадовы даход на 1 чал. (каля 6,1 тыс. дол. ЗША, 1998) адносна высокі для рэгіёна Паўд.-Усх. Азіі. Доля ў ВУП сельскай і лясной гаспадаркі разам з рыбалоўствам 11,3%, прам-сці 38%, сферы паслуг 50,7%. У сельскай гаспадарцы выкарыстоўваецца 21,5 млн. га, у т.л. пад ворнымі землямі 17,4 млн. га (каля 20% арашаецца). Пераважаюць невял. сялянскія гаспадаркі на арандаванай

памешчыцкай зямлі. Гал. харч. і экспартная культура — рыс. У перадгорных раёнах і на цэнтр. раўніне сеюць кукурузу, сою, сорга. На экспарт вырошчваюць касаву, каўчуканосы, цукр. трыснёг, джут, тапіёку, кенаф, тытунь, бананы, ананасы, арахіс, каву, чай. Вял. плошчы пад пасевамі бавоўніку. Агародніцтва. Кветкаводства. Гал. раён трапічнага земляробства — п-аў Малака. Збор (млн. т, 1999): рысу 23,5, кукурузы 4,5; кавы 75 тыс. т, пальмавых ядраў 62 тыс. т, натуральнага каўчуку 2 млн. т. Нарыхтоўка дзелавой драўніны скарачаецца (24 тыс. м^3). Гадуюць (млн. галоў, 1997): буйн. раг. жывёлу 5,7, буйвалаў 3,5, свіней 7,2, курэй 172. Вытв-сць мяса птушкі (538 тыс. т) і свініны вядзецца на прамысл. узроўні. Асн. крыніца бялку для тайландцаў — рыба. З 1960-х г. (пач. траўлернага лову рыбы — 0,4 млн. т) рэзка павялічыўся ўлоў рыбы і інш. морапрадуктаў (3,5 млн. т, 1999). Сярод галін прамысловасці найб. развіты горназдабыўная і лёгкая. У Т. здабываюць 39 відаў карысных выкапняў, з якіх 17 экспартуецца. Здабыча і вытв-сць (тыс. т, 1998): волава 15 і алавянага канцэнтрату 2, руд цынкавай 195,1, свінцовай 15,3, магніевай 0,1, жал. 90,7, вальфрамавых 0,1. Т. — адзін з найб. у свеце пастаўшчыкоў волава. Здабыча алавянай руды на в-ве Пхукет і шэльфе Андаманскага м., свінцова-цынкавых — у цэнтры і на З краіны, прыроднага газу (621 млн. м^3) на шэльфе Сіямскага зал., нафты (1,7 млн. т) на Пн Менамскай нізіны, бурага вугалю (17 млн. т) каля г. Лампанг. Вытв-сць электраэнергіі 85 млрд. кВт·гадз (1999), на ЦЭС (91%), якія працуюць на прывазной нафце і ўласным бурым вугалі, і ГЭС (9%). У апрацоўчай прам-сці пераважаюць невял. прадпрыемствы лёгкай прам-сці, сканцэнтраваныя ў Бангкоку і яго прыгарадах, Чыянгмаі, Накхонратчасіме і інш. Вытв-сць баваўняных і шаўковых тканін, адзення, абутку, джутавых мяшкоў і інш. Хуткімі тэмпамі развіваецца эл.-тэхн. і маш.-буд. прам-сць. Пераважна на экспарт вядзецца зборка камп'ютэраў і частак да іх, інтэгральных схем, эл. трансфарматараў, легкавых (126 тыс. шт.) і грузавых (325 тыс. шт.) аўтамабіляў, матацыклаў; суднарамонт. Развіта хім., нафтахім. і фармацэўтычная прам-сць. Вытв-сць натуральнага каўчуку, сінт. валакна (97,4 тыс. т), нафтапрадуктаў у Бангкоку, Накхонсітхамараце, Сірачы і інш. Харч. і харчасмакавая (рысаачышчальная, цукр., алейная, кансервавая, рыбная, піваварная, тытунёвая), лясная, дрэваапр. і папяровая прам-сць. Вытв-сць цукру — 3,9 млн. т, какосавага алею — 320 тыс. т, піва — каля 400 млн. л, паперы — 2,7 млн. т. Выраб цэменту (22,7 млн. т), керамікі, шкла. Бангкок — адзін з найб. у свеце цэнтраў па апрацоўцы самацветаў (сапфіры, ізумруды, гранаты і інш.). Маст. рамёствы (разьба па серабры і дрэве). Транспарт чыг., аўтамаб., марскі. Даўж. чыгунак 3940 км, аўтадарог 64,6 тыс. км, у т.л. з цвёрдым пакрыццём 63 тыс. км. У краіне 1,6 млн. легкавых аўтамабіляў, 4,2 млн. грузавых і аўтобусаў. У знешніх сувязях вял. роля марскога транспарту. Гал. парты: Бангкок, Сатахіп, Сірача, Пхукет. У краіне 25 аэрапортаў. У 1999 экспарт склаў 58,5 млрд. дол., імпарт — 45 млрд. долараў. Т. экспартуе камп'ютэры і камплектуючыя часткі, тэкстыль, руды волава і інш. металаў, каштоўныя камяні, каўчук, рыс, кансерваваныя морапрадукты; імпартуе машыны і абсталяванне, паліва, спажывецкія тавары. Гал. гандл. партнёры: ЗША (22% экспарту, 14% імпарту), Японія (14% і 24%), Сінгапур (9% і 5%), Малайзія (3% і 5%), Германія, Кітай, Нідэрланды і інш. Т. — краіна развітога міжнар. турызму (штогадовы даход 7 млрд. дол.). Грашовая адзінка — бат.

Узброеныя сілы. Складаюцца з рэгулярных узбр. сіл (сухап. войскі, ВПС, ВМС) і ваенізаваных фарміраванняў. Вярх. галоўнакамандуючы — прэзідэнт. Камплектаванне па прызыве. Тэрмін службы 2 гады. У рэгулярных узбр. сілах 306 тыс. чал., у ваенізаваных фарміраваннях 104 тыс. чал., у т.л. сілы самаабароны — 50 тыс. чал., патрульная пагран. паліцыя — 40 тыс. чал., марская паліцыя — 2,5 тыс. чал. (2002). У сухап. войсках 190 тыс. чал., каля 800 танкаў, больш за 800 бронетранспарцёраў, 560 буксіравальных гармат, больш за 330 гармат зенітнай артылерыі, а таксама 77 самалётаў, 184 верталёты і інш. У ВПС 48 тыс. чал., больш за 150 самалётаў. У ВМС каля 70 тыс. чал., у т.л. 18 тыс. у марской пяхоце, 1,7 тыс. ў марской авіяцыі, 20 баявых караблёў, у т.л. 1 лёгкі авіяносец, 11 фрэгатаў, 8 карветаў і інш.

Архітэктура, выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. На тэр. Т. выяўлены помнікі маст. культуры неаліту і бронз. веку (кераміка з пахаванняў, наскальныя размалёўкі). У 1—6 ст. н.э. развівалася монскае і кхмерскае мастацтва (храмы ў Лампхуне і Чыянгмаі, статуі Буды), якое стала асновай тайскай маст. культуры. З 13 ст. пад уплывамі будызму пачалося фарміраванне нац. мастацтва Т. У перыяд дзяржавы Сукатаі (з 13 ст.) склаўся тып тайскага храмавага комплексу (ват), які спалучаў свяцілішча пранг (пра-пранг) з вежападобнай закругленай вяршыняй і ступай тыпу чэдзі (пра-чэдзі) са звонападобным пакрыццём і шпілем з храмамі-веханамі (ваты Чанг Лом у Саванкхалоку, 13 ст.; Махатат у Сукатаі, 1345). Скульптура прадстаўлена шматлікімі статуямі Буды (манум. сядзячыя каменныя фігуры; бронз. выявы Буды, які ідзе, адметныя асаблівай вытанчанасцю ліній). Паставы статуй (саны) і становішчы іх рук (мудры) строга кананічныя і абазначаюць пэўныя эпізоды з жыцця Буды Гаўтамы; твары з мясц. этнічнымі рысамі. Фрагменты жывапісу сведчаць пра сувязі з М'янмай. У перыяд росквіту Сіямскай дзяржавы (14—19 ст.) традыцыі Сукатаі набылі развіццё. З 14 ст. складваліся асн. прынцыпы горадабудаўніцтва Т. Га-



Да арт. **Тайланд**. Панарама Бангкока.



Да арт. **Тайланд**. Рысавыя палі.



Тайланд. Статуя Буды з Сукатаі.



Тайланд. Летні каралеўскі палац у Сукатаі.

рады (Аютхая, Бангкок) мелі прамавугольную планіроўку, абносілі цаглянымі сценамі з лістападобнымі зубцамі. У іх цэнтры размяшчалі грандыёзныя палацы ці складаныя па формах вял. храмавыя комплексы, багата аздобленыя разьбой, шматколернай мазаікай і размалёўкамі. У храмах ставілі шматлікія статуі Буды, будынкі апяразвалі дынамічныя фрызы з выявамі малпаў, дэманаў, птушак, птушкалюдзей (кінар). Характэрныя шмат'ярусныя і шматсхільныя дахі, аркі і скляпенні якіх рабілі з дрэва. Маляўнічасць пабудовам надавалі лакавая афарбоўка з пазалотай, чырвоная і зялёная паліваная дахоўка (летні палац сіямскага караля ў г. Сукатаі, 1630). У Бангкоку захавалася некалькі дзесяткаў ватаў з групамі храмащ-ботаў, ваханаў, чэдзі, прангаў і інш. пабудоў, абкружаных галерэямі са статуй Буды (ват Сутат, пач. 19 ст.; Бенчамабапіт, «Мармуровы храм», 1900). З 14 ст. вядомы насценны жывапіс тэмперай — размалёўкі на тэмы жыцця Буды ў храмах Аютхаі (15 ст.), сцэны з «Тасачаты» і «Рамаяны» ў храмах Бангкока (18—19 ст.). З канца 19 ст. ў свецкай гар. архітэктуры з'явіліся рысы еўрап. эклектызму (атэлі, фірмы, банкі, шматпавярховыя жылыя дамы). Нар. жыллё захавала традыц. формы: прамавугольныя ў плане дамы на каркаснай аснове, 4-схільныя дахі, драўляныя будынкі на высокіх падмурках; каля рэк і каналаў — жытлы на палях. Пашырыўся жывапіс тэмперай на драўляных дошках, акварэльная мініяцюра ў рукапісных кнігах. У дэкар. мастацтве высокага ўзроўню дасягнуў лакавы жывапіс, якім аздаблялі калоны, панэлі сцен, ліштвы аконных і дзвярных праёмаў, драўляныя статуі, кніжныя пераплёты і інш. Са скуры буйвалаў рабілі плоскія сілуэтна-праразныя фігуры для тэатра ценяў «нанг». Развіваліся разьба па дрэве, чаканка па серабры. Усе элементы аздобы (фігуры, птушкі і інш.) упляталіся ў вытанчаны тайскі арнамент. З 2-й пал. 20 ст. вядзецца буд-ва на зах.-еўрап. і амер. ўзор. У выяўл. мастацтве вядуцца мадэрнісцкія пошукі сучаснай маст. формы. Традыцыі еўрап. рэалізму звязаны з нац. тайскай тэматыкай (Фуа Харабітак, Таві Нандакван, скульпт. Х'ен Йімсары, графік Маніта Пу Ары). У дэкар.-прыкладным мастацтве асн. месца займаюць лакавы жывапіс, вырабы са скуры буйвала, разьба па дрэве, чаканка, ткацтва, ціснення. Гіст. гарады Аютхая і Сукатаі ўключаны ЮНЕСКА у спіс *Сусветнай спадчыны*.

Музыка Т. з'яўляецца састаўной часткай муз. традыцыі народаў Паўд.-Усх. Азіі. Для яе характэрна адсутнасць паўтонаў, муз. творы звычайна маюць просты рытм (з невял. варыяцыямі), выконваюцца пераважна ў хуткім тэмпе, з імправізацыяй асн. мелодыі. Характэрны ўплывы інд. (з пач. н.э.), кіт. (з 17 ст.), еўрап. (з 16 ст.) муз. традыцый. У інструментарыі струнныя ку сау сам сам (са шкарлупін какосавага арэха з грыфам са слановай косці і 3 шаўковымі струнамі), цьакау (падобны на вял. гітару). З канца 19 ст. выкарыстоўваюцца еўрап. муз. інструменты. Пераважае вак. музыка, непарыўная з паэт. творчасцю, звязаная са спецыфікай інстр. суправаджэння. Да архаічных узораў адносяцца песні-загадкі (выконваюцца антыфонна). Сярод інш. песень: песні магічных рытуалаў (лакхон джатры), цырыманіяльныя (13—18 ст.), эпічныя (фонг сы і сепха), песні-спаборніцтвы (кіоу кау, выконваюцца антыфонна). Музыка — важная частка тэатралізаваных прад-



Тайланд. Будыйскія ступы ў Аютхаі.



Тайланд. Храм ват Сры Савай у Сукатаі.

стаўленняў (13—18 ст.), у межах якіх сфарміраваліся вак., інстр. і танц. стылі. Класічныя жанры вак. творчасці абапіраліся на літ. традыцыю, выкарыстоўваліся ў культавай практыцы, прыдворным муз. мастацтве, у 17—19 ст. сярод гар. знаці. На мяжы 19—20 ст. сфарміраваўся гар. тэатр папулярнага тыпу (пазней т. зв. ліке), які ў 1920—30-я г. выцесніў інш. віды тэатр. прадстаўленняў. З канца 1940-х г. пачаўся ўздым муз. творчасці пад уздзеяннем зах.-еўрап. мастацтва. На развіццё муз. мастацтва 20 ст. паўплывалі кампазітары Пхра Чэн Дур'янг, Мантры Трамот, выканаўцы Тыява Канглайтонг, Чэмчой Дур'ябханда, музыказнаўцы Кром Сінлапакон, Пхра Чэн Дур'янг, Мантры Трамот, Пхрая Ануманрачанхон. У Т. дзейнічаюць Нац. т-р Сінпакорн. Пры дэпартаменце прыгожых мастацтваў ансамблі тыпу піпхат, жаночы хор, аркестр сімф. тыпу. Нац. танц. ансамбль і інш. З 1976 праводзіцца міжнар. фестываль музыкі і танца Азіі (Бангкок).

Літ.: Рябрикова Н.В. Очерки новейшей истории Таиланда (1918—1959). М., 1960; Яе ж. Очерки новой истории Таиланда (1768—1917). М., 1966; Берзин Э.О. История Таиланда: (Краткий очерк). М., 1973; Кочетков Л.В. Таиланд. М., 1973.

Л.В.Лоўчая (прырода, насельніцтва, гаспадарка), *Я.Г.Колб* (гісторыя), *Р.Ч.Лянькевіч* (узброеныя сілы), *Я.Ф.Шунейка* (архітэктура, выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва).

ТА́ЙЛАР, Тэйлар (Tylor) Эдуард Бернет (2.10.1832, Лондан — 2.1.1917), англійскі этнограф, даследчык першабытнай культуры. З 1833 хавальнік этнагр. музея Оксфардскага ун-та, з 1896 праф. у ім. Даследаваў гісторыю культуры, найб. ўвагу аддаваў гісторыі духоўнай культуры, асабліва рэлігіі. Асн. працы — «Першабытная культура» (т. 1—2, 1871) і «Антрапалогія» (1881). Стварыў анімістычную тэорыю паходжання рэлігіі, якая доўгі час была пануючай у навуцы; рэлігію разумеў як з'яву індывід. псіхалогіі, а не як факт грамадскай свядомасці (гл. *Анімізм*). У даследаваннях т. зв. перажыткаў выявіў гіст. карані шматлікіх звычаяў і абрадаў. Разам з Г.*Спенсерам* заснаваў эвалюц. школу ў гісторыі культуры і этнаграфіі.

ТАЙМ (ад англ. time час), 1) перыяд часу, неабходны для гульні ў футбол, хакей, баскетбол і інш. спарт. гульні з мячом. 2) Частка складаных слоў, якія абазначаюць працэсы, абмежаваныя ў часе. Напр., Т.-аўт — прадугледжаны правіламі перапынак у час гульні, які назначаецца па просьбе каманды або яе трэнера; Т.-чартэр — дагавор на арэнду транспарту на пэўны тэрмін.

ТА́ЙМАНАВА, вёска ў Навабыхаўскім с/с Быхаўскага р-на Магілёўскай вобл., на правым беразе р. Дняпро, на аўтадарозе Быхаў—Рагачоў. Цэнтр калгаса. За 12 км на Пд ад горада і чыг. ст. Быхаў, 56 км ад Магілёва. 538 ж., 212 двароў (2002). Базавая школа-сад, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Каля вёскі комплекс археал. помнікаў *Тайманава*.

ТА́ЙМАНАВА, комплекс археал. помнікаў каля в. Тайманава Быхаўскага р-на Магілёўскай вобл. Адкрыў і даследаваў у 1967—83 Л.Д.Побаль. На стаянцы позняга мезаліту (6-е тыс. да н.э.) знойдзены наканечнікі стрэл, скрабкі, разцы, праколкі, рэтушаваныя пласціны і адшчэпы постсвідэрскай культуры. На лакалізаваным на гэтай тэрыторыі селішчы позняга этапу *зарубінецкай культуры* і *банцараўскай культуры* (2—8 ст. н.э.) выяўлены рэшткі 51 паўзямлянкавага жытла, ямы ад наземных і паглыбленых у мацярык жытлаў і ад розных гасп. і вытв. пабудоў. Знойдзены жал. наральнік, сярпы, нажы, шылы, зерняцёркі, верхні камень ад жорнаў, гліняныя тыглі, бронзавыя вырабы, рымскія бронзавыя і жал. фібулы, рымскія пацеркі. Керамічныя знаходкі прадстаўлены праслiцамі, грузікамі, грубаляпнымі пасудзінамі з расчосамі, ганчарнай керамікай 10—13 ст. У комплекс уваходзяць таксама яшчэ 2 селішчы, бескурганны і курганны могільнікі.

Л.Д.Побаль.



Таймені: 1 — дунайскі, або ласось дунайскі; 2 — звычайны.

ТАЙМЕ́НІ (Hucho), род рыб сям. ласасёвых атр. лососепадобных. 4 віды Т.: дунайскі ласось (H. hucho), звычайны (H. taimen), карэйскі (H. ishikawai) і сахалінскі, або чавіца (H. perryi). Жывуць у рэках і азёрах Еўразіі (ад бас. Дуная да Карэі і Сахаліна). Сахалінскі Т. адзіны прахадны від.

Даўж. да 1,5 м, маса да 60 кг. На целе Х-падобныя і паўмесяцавыя цёмныя плямкі. Зубы на сашніку ўтвараюць з паднябеннымі зубамі суцэльную дугападобную паласу (характэрная прыкмета). Галава сціснута з бакоў і нагадвае шчупаковую. У час нерасту цела становіцца чырванаватае. Кормяцца дробнай рыбай. Аб'екты промыслу.

ТА́ЙМЕР (англ. timer ад time час; адзначаць час), лічыльнік часу, які выдае сігнал праз зададзены прамежак часу. Выкарыстоўваецца як прылада, якая ўключае (выключае) машыну ці інш. апарат прамысл. або быт. прызначэння пасля сканчэння зададзенага прамежку часу.

ТАЙМЫ́Р, Таймырскае возера, у Таймырскай (Даўгана-Ненецкай) аўт. акрузе, у Расіі, на У п-ва *Таймыр*, у гарах Быранга. Пл. зменьваецца ад 4,5 тыс. км^2 у разводдзе да 1,2 тыс. км^2 зімой. Даўж. 200 км, шыр. ад некалькіх кіламетраў да 80 км, глыб. да 25,2 м. Размешчана ў тэктанічнай упадзіне, апрацаванай ледавіком. Берагі парэзаны мелкаводнымі залівамі і бухтамі. Паўн. бераг стромкі, паўд. — пакаты. У зах. ч. некалькі камяністых астравоў. Упадае р. Верхняя Таймыра, выцякае р. Ніжняя Таймыра. Т. свабодны ад лёду 64 дні (сярэдзіна ліп.—сярэдзіна вер.) за год. Ваганні ўзроўню вады на працягу года да 6 м. Рыбалоўства.

ТАЙМЫ́Р, востраў у Карскім м., у Таймырскай (Даўгана-Ненецкай) аўт. акрузе, у Расіі, каля ўзбярэжжа п-ва *Таймыр*. Пл. 350 км^2, даўж. каля 37 км, шыр. каля 19 км, выш. да 235 м. Складзены пераважна з пясчанікаў і сланцаў. Арктычная тундра. Адкрыты і названы ў 1878 экспедыцыяй Н.А.Э.*Нордэншэльда*.

ТАЙМЫ́Р, Таймырскі паўвостраў. На Пн азіяцкай ч. Расіі, у Таймырскай (Даўгана-Ненецкай) аўт. акрузе, паміж Енісейскім зал. Карскага м. і Хатангскім зал. мора Лаптевых. Крайні паўн. пункт Т. — мыс Чэлюскін, паўд. мяжа — паўн. ўступ Сярэднесібірскага пласкагор'я. Пл. каля 400 тыс. км^2, даўж. каля 1000 км, шыр. больш за 500 км. Берагі пераважна нізкія, моцна парэзаныя. У цэнтр. ч. — горы Быранга (выш. да 1146 м), якія працягваюцца з ПнЗ на ПдУ. Паўн.-Таймырская і Паўн.-Сібірская нізіны. Радовішчы кам. вугалю. Клімат суровы, арктычны. Ападкаў 115—230 мм за год. Пашырана шматгадовая мерзлата. Найб. рэкі: Пясіна, Верхняя і Ніжняя Таймыра, Хатанга. Шмат азёр, найб. *Таймыр*. На Пн арктычныя і высакагорныя пустыні і паўпустыні, у сярэдняй ч. тундра, на крайнім Пд лесатундра. У складзе жывёльнага свету: заяц-бяляк, пясец, ліс, воўк, паўн. алень, белы мядзведзь; у моры — бялуха, нерпа, морж; летам шмат птушак.

ТАЙМЫ́РСКАЯ (ДАЎГА́НА-НЕ́НЕЦКАЯ) АЎТАНО́МНАЯ АКРУ́ГА. Размешчана на Крайняй Поўначы Усх. Сібіры ў Краснаярскім краі Рас. Федэрацыі. Уключае архіпелагі Паўн. Зямля, Нордэншэльда і інш., абмываецца морамі Лаптевых і Карскім. Пл. 862,1 тыс. км^2. Нас. 44 тыс. чал. (2000), гарадскога 66%. Цэнтр — г. *Дудзінка*. На тэр. акругі горад краявога падпарадкавання Нарыльск і падпарадкаваныя Нарыльскай. гар. адміністрацыі гарады Талнах і Каеркан. Гл. карту да арт. *Краснаярскі край*.

Займае п-аў *Таймыр*, паўн. ч. Сярэднесібірскага пласкагор'я з плато Пута-

рана (выш. да 1629 м) і размешчаную паміж імі Паўн.-Сібірскую нізіну. На ПдЗ, на левабярэжжы р. Енісей — ч. Зах.-Сібірскай раўніны. Карысныя выкапні: медна-нікелевыя і спадарожныя руды (малібдэн, кобальт, вальфрам), каменны вугаль, прыродны газ, нафта, кухонная соль. Клімат арктычны і субарктычны. Сярэдняя т-ра студз. -32 °С, ліп. 2—13 °С. Ападкаў каля 250 мм за год. Пашырана шматгадовая мерзлата. Гал. рэкі: Енісей, Пясіна, Хатанга, Верхняя і Ніжняя Таймыра. Шмат азёр (Таймыр, Лама, Пясіна, Хантайскае) і балот. Пераважаюць тыповыя тундравыя і тарфяна-глеевыя глебы. Арктычная мохава-лішайнікавая і хмызнячковая тундра зменьваецца на Пд лесатундрай з рэдкастойнымі лістоўнічнымі лясамі і хмызнякамі. Путаранскі і Таймырскі запаведнікі.

Асн. галіны прам-сці: горназдабыўная (каменны вугаль, газ) і рыбная (рыбазаводы ў Дудзінцы, Дыксане, Хатанзе). Усць-Хантайская ГЭС. Вытв-сць буд. матэрыялаў. Сельская гаспадарка спецыялізуецца на аленегадоўлі. Нязначна развіты мяса-малочная жывёлагадоўля і



Да арт. **Таймырская (Даўгана-Ненецкая) аўтаномная акруга**. На Таймыры.

птушкагадоўля. Пушны промысел і звераґадоўля (блакітны пясец і серабрыста-чорны ліс). Цяплічная гаспадарка. Суднаходства па рэках Енісей (у межах акругі даступна марскім суднам), Хатанга, *Паўночным марскім шляху*. Гал. парты: Дудзінка, Дыксан, Хатанга. Чыгунка Дудзінка—Нарыльск—Талнах. Аэрапорты: Алыкель (за 40 км на З ад Нарыльска), Дыксан, Хатанга. Газаправод Месаяха—Дудзінка—Нарыльск. Мясц. перавозкі на аленях і сабаках.

ТАЙМЫ́РСКАЯ НІЗІ́НА, гл. *Паўночна-Сібірская нізіна*.

ТАЙМЫ́РСКІ ЗАПАВЕ́ДНІК. У Таймырскай (Даўгана-Ненецкай) нац. акрузе (Расія), на правабярэжжы р. Таймыр. Пл. 1781,9 тыс. га. Засн. ў 1979. Пакатахвалістая раўніна з узгорыста-градавымі ўчасткамі, на ПнУ адгор'і гор Быранга (выш. да 567 м). Арктычныя і субарктычныя тундры, у адгор'і Быранга ўчасткі арктычных пустынь. На тэр. Т.з. самыя паўн. ўчасткі лясных масіваў даўрскай лістоўніцы. У фауне 16 відаў млекакормячых (заяц-бяляк, воўк, пясец, гарнастай, паўн. алень і інш.), з іх у Чырв. кнізе Расіі белы мядзведзь і морж лапеўскі; 85 відаў птушак (зімнік, сава белая, курапатка белая і тундраная, гусь-гуменнік, гага, гагара тундраная, кулікі, чайкі і інш.), з іх у Чырв. кнізе лебедзь малы, арлан-белахвост, беркут, крэчат, сапсан, казарка чорная, гагара чырвонаваллёвая. У іхтыяфауне больш за 20 відаў, у т.л. сіговыя, ласасёвыя, харыусавыя.

ТА́ЙНА ПЕРАПІ́СКІ, адно з канстытуцыйных правоў чалавека. Уключае недатыкальнасць усіх відаў паштова-тэлеграфных адпраўленняў (лістоў, тэлеграм, пасылак, пераводаў), тэлефонных размоў і інш. паведамленняў, забарону ўскрываць, знаёміцца і выдаваць змест карэспандэнцыі. Абмежаванне Т.п. дапускаецца толькі ў выпадках, прадугледжаных законам (у інтарэсах барацьбы са злачыннасцю, забеспячэння дзярж. бяспекі). Т.п. ў Рэспубліцы Беларусь гарантуецца арт. 28 Канстытуцыі.

ТА́ЙНАЕ ГАЛАСАВА́ННЕ, від галасавання на выбарах і рэферэндуме, пры якім выключаны кантроль за волевыяўленнем выбаршчыкаў. Свабода волевыяўлення пры Т.г. дасягаецца праз галасаванне бюлетэнямі, шарамі або спец. машынамі для галасавання. Найб. пашырана Т.г. бюлетэнямі, якія змяшчаюць розныя варыянты вынесенага на галасаванне рашэння. Бюлетэнь запаўняецца выбаршчыкам у асобым пакоі або кабіне і апускаецца ў выбарчую скрынку (урну) у складзеным выглядзе або ў спец. канверце.

ТА́ЙНАНЬ, горад у Кітаі, на ПдЗ в-ва Тайвань. Адміністрацыйна ўключае аванпорт Аньпін. 705,6 тыс. ж. (2000). Трансп. вузел. Гандл.-прамысл. цэнтр развітога с.-г. раёна (цукр. трыснёг, рыс). Прам-сць: цукр., хім., тэкстыльная. Паблізу здабыча каменнай солі.

ТА́ЙНАПІС, тое, што *крыптаграфія*.

ТА́ЙНАЯ ВЯЧЭ́РА, паводле Евангелляў, апошняя сумесная трапеза Ісуса *Хрыста* і дванаццаці апосталаў у Іерусаліме напярэдадні «перадвелікоднай пятніцы», распяцця Хрыста на крыжы і яго смерці. У час святочнай вячэры, прыгатаванай вучнямі (апосталамі), Хрыстос прадказаў, што адзін з іх (*Іуда Іскарыёт*) здрадзіць яму. Надламаўшы хлеб, Ісус даў яго з'есці вучням са словамі: «гэта ёсць цела маё», потым даў ім папіць з кубка з віном, кажучы: «гэта ёсць кроў мая Новага Запавету, якая за многіх праліваецца». Ён завяршчаў вучням і надалей рабіць так, як успамін пра яго, уводзячы тым самым адно з таінстваў хрысц. царквы — *прычасце* (еўхарысцыю).

ТА́ЙНАЯ КАНЦЫЛЯ́РЫЯ, цэнтральная следчая і суд. па паліт. справах дзярж. ўстанова ў Расіі 18 ст. Засн. *Пятром I* у лют. 1718 у Маскве як часовая надзвычайная камісія па справе царэвіча *Аляксея Пятровіча*. З сак. 1718 у Пецярбургу (да 1723 філіял у Маскве), дзе набыла пастаянны характар. Разглядала найважнейшыя паліт. справы: замахі на цара і вышэйшых саноўнікаў, спробы паліт. пераваротаў, дзярж. здрада, шпіянаж, буйныя казнакрадствы і хабарніцтвы, антыўрадавыя паўстанні, раскольніцтва і інш. Падпарадкоўвалася асабіста цару і часткова Сенату. Складалася з установы (2—4 «міністры», ці суддзі, з якіх адзін — П.А.*Талстой* — лічыўся гал. начальнікам) і ўласна канцылярыі (2—4 канцылярысты і 4—6 падканцылярыстаў і капіістаў). Прыгаворы «міністраў» зацвярджаў цар, часам і сенат. Следства суправаджалася катаваннямі. Т.к. скасавана *Кацярынай I* (указ ад 8.6.1726), функцыі перайшлі да Праабражэнскага прыказа (1695—1729, таксама орган паліт. вышуку і суда) і *Вярхоўнага тайнага савета*. У 1731 адноўлена пад назвай Канцылярыя тайных і вышуковых спраў (або проста Т.к.), якую скасаваў *Пётр III* указам ад 23.2.1762.

Літ.: Рууд Ч., Степанов С. Фонтанка, 16: Политич. сыск при царях. М., 1993.

А.М.Лукашэвіч.

ТА́ЙНАЯ ЭКСПЕДЫ́ЦЫЯ пры Сенаце, цэнтральная следчая і суд. па паліт. справах дзярж. ўстанова ў Расіі ў 1762—1801. Створана *Кацярынай II* пры 1-м дэпартаменце Сената замест скасаванай у лют. 1762 Канцылярыі тайных і вышуковых спраў (*Тайнай канцылярыі*). Знаходзілася ў Петрапаўлаўскай крэпасці Пецярбурга, мела кантору ў Маскве (на Лубянцы). Т.э. афіцыйна ўзначальваў ген.-пракурор Сената, яго памочнікам і фактычным кіраўніком спраў быў обер-сакратар (у 1762—93 вядомы сваёй жорсткасцю С.І.Шашкоўскі). Т.э. праводзіла следствы і суды па важных паліт. справах для разгляду найб. значных з іх (спроба падпаручніка В.Я.Міровіча

вызваліць са зняволення б. імператара *Івана VI* у 1764, маскоўскі бунт 1771, справы Е.І.*Пугачова*, А.М.*Радзішчава*, Т.*Касцюшкі* і інш.). Пры Т.э. ствараліся часовыя следчыя камісіі. Следства часта суправаджалася катаваннямі. Т.э. скасавана Аляксандрам I 14.4.1801.

Літ.: Рууд Ч., Степанов С. Фонтанка, 16: Политич. сыск при царях. М., 1993.

А.М.Лукашэвіч.

ТА́ЙНІК (Listera), род кветкавых раслін сям. архідных. Каля 30 відаў. Пашыраны ў Еўразіі і Паўн. Амерыцы. На Беларусі 2 віды Т.: сэрцападобны (L. cordata) і яйцападобны (L.ovata), занесеныя ў Чырв. кнігу. Трапляюцца ў вільготных і забалочаных лясах, на ўскрайках балот, нізінных лугах.

Шматгадовыя карэнішчавыя травы. Ліс це супраціўнае, рознай формы. Кветкі дробныя, зеленаватыя ці жаўтаватыя, у верхавінкавых гронках. Плод — каробачка. Лек. расліны.

А.М.Скуратовіч.



Тайнік: 1 — сэрцападобны; 2 — яйцападобны.

ТА́ЙНІКАЎ Уладзімір Іванавіч (н. 23.6.1959, в. Худава Крупскага р-на Мінскай вобл.), бел. спартсмен (веславанне на байдарках і каноэ; дыстанцыі 500 і 1000 м). Засл. майстар спорту СССР (1978). Скончыў Бел. ін-т фіз. культуры (1981). З 1998 прэзідэнт Федэрацыі веславання на байдарках і каноэ Мінскай вобл., з 2002 дырэктар вучэбна-спарт. базы Бел. дзярж. акадэміі фіз. культуры. Чэмпіён свету сярод юніёраў (1977) на байдарцы-адзіночцы і байдарцы-чацвёрцы. Чэмпіён свету (1978), срэбраны прызёр (1979), бронз. прызёр (1978, 1979). Чэмпіён СССР (1977, 1978, 1979, 1980).

ТА́ЙНМУТ (Tynemouth), горад у Вялікабрытаніі, на ПнУ Англіі, у канурбацыі Тайнсайд. Каля 100 тыс. ж. (2001). Рыбалавецкі порт на Паўночным м., каля вусця р. Тайн. Прам-сць: маш.-буд., хім., дрэваапр., харч., швейная. Клімат. курорт.

ТА́ЙНЫЯ МО́ВЫ, умоўныя мовы, традыцыйная назва групы *жаргонаў* (гл. *Арго*), для якіх уласціва канспіратыўная функцыя, звязаная з імкненнем носьбітаў утаіць сакрэты сваёй вытворчай і інш. дзейнасці. Т.м. былі знакамі прыналежнасці да карпарацыі і свайго роду калект. гульнёй. Напр., лемезень (мова дрыбінскіх шапавалаў на Беларусі), афеня (мова бадзяг-гандляроў у Расіі), ротвелш (мова жабракоў у Германіі) і інш. Т.м. фактычна не маюць уласнай граматыкі (у адрозненне ад тэр. дыялектаў, але вылучаюцца адметнасцю лексікі, часткова запазычанай з самых розных моў, часткова ўтворанай штучна. Т.м. вывучаюць сацыялінгвістыка, сацыялогія, дыялекталогія, этымалогія.

Літ. Бондалетов В.Д. Условные языки русских ремесленников и торговцев. Вып. 1. Рязань, 1974.

А.Я.Міхневіч.

ТАЙПІ́НСКАЕ ПАЎСТА́ННЕ 1851—64, апошняя ў гісторыі Кітая вял. сял. вайна. У значнай ступені абумоўлена перанаселенасцю краіны і звязаным з ёй недахопам ворнай зямлі. Становішча пагаршалася паражэннем Кітая ў *англа-кітайскай вайне 1840—42* і ўцечкай серабра з Кітая ў выніку еўрап. кантрабанды опіуму, што выклікала фін.-эканам. крызіс. Няздольнасць урада маньчжурскай дынастыі *Цын* вырашыць праблемы краіны прывяла ў 1841—49 да шэрагу нар. паўстанняў. Заснавальнік руху тайпінаў — вясковы настаўнік *Хун Сюцюань*, які ў 1843 стварыў «Таварыства пакланення нябеснаму ўладару» (Байшандзіхуй). Ідэйнай асновай таварыства абвешчана хрысціянства, але ў інтэрпрэтацыі Хун Сюцюаня хрысц. ідэя адзінага Бога спалучалася з традыц. кіт. ўяўленнямі аб сац. роўнасці і справядлівасці — тайпін (кіт. «вял. роўнасць» — адсюль Т.п.). 11.1.1851 таварыства пачало паўстанне пад лозунгам стварэння «Нябеснай дзяржавы вял. працвітання» (Тайпін цяньго). Хун Сюцюань абвясціў сябе Цяньванам (нябесным гасударом). Армію і ўрад тайпінаў узначаліў Ян Сюцын. Створанае тайпінамі моцнае дысцыплінаванае войска заняло вял. тэр. на Пд ад р. Янцзы, а ў 1853 — г. Нанкін, які стаў сталіцай тайпінскай дзяржавы. Быў выдадзены дакумент «Зямельная сістэма нябеснай дынастыі», які дэкларава ў ураўняльнае размеркаванне зямлі па едаках, але рэалізаваць яго не ўдалося. У 1856 паміж кіраўнікамі руху тайпінаў паглыбіліся супярэчнасці. Са згоды Хун Сюцюаня былі забіты Ян Сюцын і некат. яго паплечнікі. Пасля заканчэння *англа-французска-кітайскай вайны 1856—60* вял. дапамогу цынскаму ўраду ў задушэнні Т.п. аказалі еўрап. дзяржавы. Частковыя поспехі войск тайпінаў на чале з палкаводцам *Лі Сючэнам* не змаглі прадухіліць паражэнне Т.п. У ліп. 1864 паў Нанкін, Хун Сюцюань скончыў жыццё самагубствам. У 1868 знішчаны апошнія асяродкі паўстання.

Літ.: Тайпинское восстание 1850—1864 гг.: Сб. док. М., 1960; Илюшечкин В.П. Крестьянская война тайпинов. М., 1967.

У.У.Куніцкі.

ТА́ЙСКІЯ МО́ВЫ, сям'я моў, пашыраных на п-ве Індакітай і ў прылеглых раёнах Паўд. Кітая. Займаюць прамежкавае становішча паміж *кітайска-тыбецкімі мовамі* і *аўстранезійскімі мовамі*. Падзяляюцца на 3 групы: паўд.-зах. (мовы тайская, лаоская, шанская, ахом, юан, кхын і інш.), цэнтр. (тай, нунг, паўд. чжуанскія дыялекты), паўн. (буй, паўн. чжуанскія дыялекты). Да Т.м. прымыкаюць кадайскія мовы (лі, лакуа, лаці, гэлао), дун-шуйскія мовы (дун, шун, ман, тхен) і інш. Усе Т.м. тыпалагічна падобныя. Ім уласцівы ізалюючы лад, фаналагічная і сінтаксіс. блізкасць, супадзенне марфемы са складам, адсутнасць словазмянення, коранескладанне. Пісьменнасць бярэ пачатак (помнікі з канца 13 ст.) ад інд. пісьма. Выкарыстоўваецца таксама іерагліфіка і лацінка.

Літ.: Морев Л.Н., Плам Ю.Я., Фомичева М.Ф. Тайский язык. М., 1961.

А.Я.Міхневіч.

ТАЙФУ́Н (англ. typhoon ад кіт. тай фын — вялікі вецер), назва *трапічных цыклонаў* штармавой і ўраганнай сілы (скорасць ветру 30—50 км/гадз, асобныя парывы да 100 км/гадз) у зоне распаўсюджання мусонаў Усх. Азіі. Узнікаюць пераважна летам і восенню над Ціхім ак., на У ад Філіпінскіх а-воў, дасягаюць берагоў Кітая, Японіі, Карэі, уплываюць на надвор'е Д. Усходу Расіі. Дыяметр Т. некалькі соцень кіламетраў. Выклікае моцнае хваляванне мора, часта суправаджаецца ліўнямі, навадненнямі, прыводзіць да разбурэнняў і прычыняе вял. матэрыяльныя страты. За год бывае 20—30 Т., працягласць асобных ад некалькіх дзён да некалькіх тыдняў.

ТАЙХУ́, возера на У Кітая, на правабярэжнай ч. даліны р. Янцзы, каля яе дэльты. Пл. 2,2—3,6 тыс. км^2. Прэснае. Летам паўнаводнае, глыб. да 12 м, зімой мялее. Злучана пратокамі з *Вялікім каналам*. Выкарыстоўваецца для арашэння рысавых палёў, суднаходства, рыбалоўства.

ТАЙЦ Марк Юр'евіч (н. 15.6.1927, Мінск), бел. вучоны ў галіне біяхіміі і радыяцыйнай біялогіі. Д-р біял. н. (1973). Скончыў Мінскі мед. ін-т (1950). З 1959 у Ін-це фізіялогіі АН Беларусі. З 1991 у Ізраілі. Навук. працы па механізмах уздзеяння малых доз іанізуючай радыяцыі на кару надніркавай, канфармацыйных зменах мітахандрыяльных мембран клетак галаўнога мозга пад уздзеяннем стрэс-фактараў.

Тв.: Зависимость реакции системы гипофиз—кора надпочечников от условий воздействия ионизирующей радиации в малых дозах (разам з Т.В.Дудзінай) // Радиобиология. 1976. Т. 16, № 2; Метабалічныя зрухі ў дэлабірынтаваных жывёлін на ўздзеянне іанізуючай радыяцыі ў малых дозах (у сааўт.) // Весці АН БССР. Сер. біял. навук. 1983. №4.

М.К.Туміловіч.

ТАЙЧЖУ́Н, горад у Кітаі, на З в-ва Тайвань. 848,3 тыс. ж. (2000). Трансп. вузел. Цэнтр асноўнага с.-г. раёна вострава і значны прамысл. цэнтр. Прам-сць: маш.-буд., у т.л. авіязборка; цукр., папяровая, хім., тэкст.; вытв-сць камфары.

ТАКАВА́ННЕ, форма шлюбных паводзін птушак у перыяд размнажэння. Садзейнічае прывабліванню самак або самцоў, прывядзенню іх у стан гатоўнасці да спароўвання, спрыяе адбору найб. актыўных і дужых партнёраў. Выражаецца ў спевах, такавых палётах, позах, якія дэманструюць яркае пер'е, і інш., бойках, турнірах, будове несапр. гнёздаў. Найб. характэрна для самцоў палігамных відаў курападобных (цецерукі, глушцы, рабчыкі) і кулікоў. У манагамных відаў самец такуе каля самкі (напр., лебедзь); у паліандраў такуюць самкі (кулікі-плывунчыкі, каляровыя бакасы).







Такаванне: 1 — жураўля антыгона; 2 — дзікага індыка; 3 — глушца.

ТАКА́ЖЭВІЧ (Tokarzewicz) Юзаф (8.1.1841, г. Бельск-Падляскі Падляскага ваяв., Польшча — 2.8.1919), польскі публіцыст, пісьменнік. Скончыў Беластоцкую гімназію (1859), вучыўся ў Маскоўскім (1859—61) і Парыжскім ун-тах. У 1861 за ўдзел у студэнцкай дэманстрацыі ў Пецярбургу арыштаваны. Удзельнік паўстання 1863—64. Пасля — у эміграцыі. Заснаваў «Міжнароднае таварыства польскіх студэнтаў». Рэдагаваў двухтыднёвік «Przyszłość» («Будучыня», 1866), выпускаў рэв.-дэмакр. выданне «Gmina» («Супольнасць», 1866—67, напачатку выдавалася ў друкарні А.Герцэна ў Жэневе). Прапагандаваў тэорыю абшчыннага сацыялізму Герцэна. Арт. «Рускае пытанне» (1868) прысвяціў становішчу рус. і бел. народаў. З 1882 на радзіме. У 1883—93 супрацоўнік час. «Kraj» («Край», Пецярбург). У 1902—04 жыў на Слонімшчыне ў маёнтку М.Федароўскага, вёў з ім фалькл.-этнагр. даследаванні. Аўтар аповесцей «Пан сляпы Павал» (1881) і «Пан глухі Гавал» (1891), успамінаў «У дні вайны і голаду» (1900). Федароўскі прысвяціў яму ўспаміны «Юзаф Такажэвіч — апошні камандзір атрада 1863 г.» (1921).

Літ.: Литературное наследство. Т. 62. М., 1955; Белаказовіч В. Юзаф Такаржэвіч (1841—1919) // Ніва (Беласток). 1963. № 2—4; Саламевіч Я. Міхал Федароўскі. Мн., 1972; Żabicki Z. Z problemów ideologii i estetyki pozytywizmu: Publicystyka emigracyjna Józefa Tokarzewicza na tle prądów epoki. Warszawa, 1964.

І.У.Саламевіч.

ТАКАІШВІ́ЛІ Сесіль Дзмітрыеўна (13.10.1906, г. Батумі, Грузія — 21.5.1984), грузінская актрыса. Нар. арт. СССР (1966). Скончыла драм. студыю пад кіраўніцтвам А.Пагавы (1926). З 1926 у Т-ры імя Ш.Руставелі, у 1930—67 у Т-ры імя К.Марджанішвілі ў Тбілісі. Мастацтва Т. адметнае вастрынёй формы, самабытнасцю, гумарам, яркай характарнасцю. Сярод роляў: Анка («Паэма пра сякеру» М.Пагодзіна), Катарына («Утаймаванне свавольніцы» У.Шэкспіра), Агудалава («Беспасажніца» А.Астроўскага), каралева Лізавета («Марыя Сцюарт» Ф.Шылера), Бабуля («Я, бабуля, Іліко і Іларыён» Н.Думбадзе і Р.Лордкіпанідзе). Здымалася ў кіно. Дзярж. прэмія Грузіі 1983.

ТАКАМА́ЦУ, горад у Японіі, на ПнУ в-ва Сікоку. Адм. ц. прэфектуры Кагава. Каля 400 тыс. ж. з прыгарадамі (2001). Марскі порт. Чыг. паромам звязаны з в-вам Хонсю. Прам-сць: маш.-буд., цэлюлозна-папяровая, металаапр., харч., дрэваапр., мэблевая. Традыц. народныя рамёствы. Ун-т. Паблізу нац. парк Ясіма.

ТАКАМБА́ЕВА Айсулу Асанбекаўна (н. 22.9.1947, Бішкек), кіргізская артыстка балета. Нар. арт. Кіргізіі (1976). Нар. арт. СССР (1981). Скончыла Ленінградскае харэагр. вучылішча (1966). З 1966 салістка Кіргізскага т-ра оперы і балета імя А.Малдыбаева. Яе выкананне вылучаецца дасканалай тэхнікай класічнага танца, псіхалагізмам, тэмпераментам, сцэн. абаяльнасцю. Сярод партый: Чалпон і Адай («Чалпон» М.Раўхвергера), Каханне і Жыццё («Несмяротнасць» Ч.Нурымава), Шырын і Мехменэ Бану («Легенда пра каханне» А.Мелікава), Талганай («Мацярынскае поле» К.Малдабасанава), Асель («Асель» У.Уласава), Жызэль («Жызэль» А.Адана), Марыя («Бахчысарайскі фантан» Б.Асаф'ева), Фларына, Адэта—Адылія («Спячая прыгажуня», «Лебядзінае возера» П.Чайкоўскага), Нікія («Баядэрка» Л.Мінкуса), Фрыгія («Спартак» А.Хачатурана), Аксаніда («Праметэй» Э.Арыстакесяна). Дзярж. прэмія СССР 1976.

Л.А.Сівалобчык.

ТАКАМБА́ЕЎ Аалы (7.11.1904, с. Чон-Кемін Кемінскага р-на Чуйскай вобл., Кіргізія — 19.6.1988), кіргізскі пісьменнік. Нар. паэт Кіргізіі (1945). Акад. АН Кіргізіі (1954). Герой Сац. Працы (1974). Скончыў Сярэднеазіяцкі камуніст. ун-т (1927). Друкаваўся з 1924. Для ранняй творчасці Т. характэрны рэв. пафас: зб-кі вершаў «Пра Леніна» (1927), «Атака» (1932); аповесць «Днестр упадае ў глыбокае мора» (1939) і інш. У пасляваен. гады выступаў як майстар рэаліст. паэмы: «Сваімі вачыма» (1952), «Мелодыя камуза» (1960), зб-кі вершаў «Голас часу» (1966), «Мой падарунак» (1974). Аўтар гіст. рамана ў вершах «Перад світаннем» (1935—47). На бел. мову яго асобныя творы перакладалі Р.Барадулін, В.Іпатава, У.Шахавец. Дзярж. прэмія Кіргізіі імя Тактагула Сатылганава 1967.

Тв.: Бел. пер. — у кн.: Братэрства, 86. Мн., 1986; Рус. пер. — Мастер. Стихи. М., 1982; Надежда: Лирика и поэмы. Фрунзе, 1983.

Літ.: Уметалиев Ш. А.Токомбаев. Фрунзе, 1964.

ТАКАНТЫ́НС (Tocantins), рака на У Бразіліі. Даўж. 2850 км, пл. бас. 770 тыс. км^2. Утвараецца ад сутокаў рэк Мараньян і Алмас, якія пачынаюцца ў цэнтр. ч. Бразільскага пласкагор'я, цячэ па ім, утварае пароги і вадаспады. Ніжняе цячэнне па Амазонскай нізіне. Упадае ў р. Пара (правы рукаў дэльты р. Амазонка). Буйны прыток — р. Арагуая (злева). Разводдзе з кастр. да сак.— красавіка. Сярэдні расход вады ў вусці 16,8 тыс. м^3/с. Вадасх. Тукуруі. Суднаходная на 350 км ад вусця.



Да арт. **Такарнае рамяство**. Такарны станок.

ТАКА́РНАЕ РАМЯСТВО́, выраб рэчаў быт. і маст. прызначэння на *такарным станку*. Засн. на апрацоўцы разцом загатоўкі з дрэва, косці, металу, каменю і інш., прыведзенай у вярчальны рух. Часта спалучаецца з разьбой, інкрустацыяй, гравіраваннем, паліраваннем, размалёўкай і інш. Здаўна пашырана ў многіх народаў свету. Шырока вядомы хахламское і полхаўска-майданскае (Расія) Т.р. ў спалучэнні з размалёўкай, гуцульскае (Украіна) — з разьбой і інш.



Да арт. **Такарнае рамяство**. Вырабы з с. Полхаўскі Майдан і с. Круцец Ніжагародскай вобл. Расія. 1970-я г.



Да арт. **Такарнае рамяство**. Вырабы з размалёўкай. Брэсцкая фабрыка сувеніраў. 1980-я г.

На Беларусі прасцейшыя такарныя станкі ўвайшлі ў практыку з 11—13 ст., тады ж Т.р. вылучылася ў самаст. рамяство. З дрэва і косці тачылі дробныя прадметы (посуд, гузікі, шахматы, тронкі нажоў і інш.), нярэдка аздабляліі гравіраваным арнаментам. Шмат бел. майстроў-токараў у 17 ст. працавалі ў Маскоўскім Крамлі, дзе яны выраблялі драўляныя дэталі мэблі, арх. ўбранства, шахматы, чарніліцы, парахоўніцы са слановай косці. У 19 — 1-й пал. 20 ст. Т.р. пашырылася ў нар. побыце; у многіх выпадках было дапаўненнем у сталярным, бандарным, стальмашным рамёствах. Т.р. нярэдка займаліся цэлыя вёскі. Тачылі сталовы посуд (міскі, талеркі, ступкі, сальніцы, бочачкі), быт. прадметы (попельніцы, люлькі, падсвечнікі, бязмены), вытв. прылады (калаўроты, верацёны), дэталі мэблі, трансп. сродкаў, арх. аздаблення і інш. Найб. выкарыстоўваўся даўні варыянт такарнага станка, які ўяўляў сабою 2 стойкі з метал. стрыжнямі, паміж якімі гарызантальна зацiскалі загатоўку. Вярчальны рух ёй надаваў шнур (рэмень, вяроўка), што ахопліваў загатоўку і адным канцом мацаваўся ўверсе да спружыністага рычага (жэрдкі, заткнутай за бэльку), другім — да дошкі, што ляжала на падлозе. Націскаючы нагой на дошку, прыводзілі ў вярчэнне загатоўку і апрацоўвалі яе разцом. Дробныя вырабы (верацёны, рукаяткі інструментаў) выточвалі на ручным варыянце станка—смыку. У наш час Т.р. (пераважна з дрэва) развіваецца на некат. ф-ках маст. вырабаў, ім займаюцца нар. майстры, якія вырабляюць рэчы быт., сувенірнага, утылітарна-маст. прызначэння.

Літ.: Сахута Я. Такарныя вырабы // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1975. №1. *Я.М.Сахута.*

ТАКА́РНЫ СТАНО́К, станок для апрацоўкі рэзаннем загатовак з металаў і інш. матэрыялаў у выглядзе цел вярчэння; найб. пашыраны тып *металарэзных станкоў*.

На Т.с. робяць аперацыі: абточванне цыліндрычных, канічных, тарцовых і фасонных паверхняў; адразанне, расточванне; праточванне канавак; наразанне рэзьбаў і інш. Загатоўка атрымлівае вярчэнне ад *шпіндэля*, рэзальны інструмент перамяшчаецца па розных траекторыях. Адрозніваюцца Т.с. канструкцыі-



Такарны станок: а — універсальны такарна-вінтарэзны (Германія): 1 — пярэдняя бабка; 2 — шпіндэль; 3 — супарт; 4 — люнет; 5 — задняя бабка; 6 — хадавы вінт; 7 — хадавы вал; 8 — станіна; б — шматмэтавы станок (Японія).

яй і тэхнал. магчымасцямі (такарна-вінтарэзныя, -рэвальверныя, -лабавыя, -карусельныя, -запатыльныя і інш.), размяшчэннем восі шпіндэля ў прасторы (гарыз., верт.), колькасцю інструментаў (адна- і шматразцовыя) і шпіндэляў (адна- і шматшпіндэльныя), дакладнасцю, ступенню аўтаматызацыі (звычайныя, паўаўтаматы, аўтаматы) і інш. Існуюць спецыялізаваныя (напр., колатакарныя) і спец., у т.л. для апрацоўкі вырабаў з драўніны, пластмасы і інш. матэрыялаў.

На Беларусі Т.с. з вертыкальным шпіндэлем і з лічбава-праграмным кіраваннем вырабляе *Мінскі завод аўтаматычных ліній.* *А.І.Качаргін.*

ТАКА́ТА (італьян. toccata ад toccare дакранацца), віртуозная муз. п'еса для клавішнага інструмента (фп., арган) у хуткім тэмпе і з выразным рытмам, звычайна з перавагай ударнай акордавай тэхнікі. У 16—18 ст. — арганная і клавірная ўступная п'еса тыпу *прэлюдыі* (І.С.Бах), у 19—20 ст. — канцэртная фп. п'еса тыпу *эцюда* (Р.Шуман, К.Дэбюсі, М.Равель, С.Пракоф'еў).

ТАКАФЕРО́ЛЫ (ад грэч. tokos прыплод, патомства + phero нясу + лац. oleum алей), вітамін Е, група метыльных вытворных (α, β, γ, δ,) таколу; адзін з тлушчарастваральных вітамінаў.

Т. — алеі светла-жоўтага колеру, нерастваральныя ў вадзе, добра растваральныя ў арган. растваральніках. Малекулярная маса α- Т. (найб. біялагічна актыўны) 430,7, $t_{пл}$. 2,5—3,5 °С. Пашыраны ў прыродзе гал. чынам у зерні пшаніцы і рысу, алеях (сланечнікавым, кукурузным і інш.), таксама ў салаце, шпінаце. Жывёлы і чалавек атрымліваюць Т. з ежай. З'яўляюцца *антыаксідантамі.* Забяспечваюць стабільнасць клетачных і субклетачных мембран, эфектыўнасць тканкавага дыхання і інш. Недахоп Т. прыводзіць да бясплоддзя, мышачнай дыстрафіі, некрозу печані і інш. Патрэба чалавека 10—20 мг α–Т. у суткі.

І.М.Семяненя.

ТАКВІ́ЛЬ (Tocqueville) Алексіс (29.7.1805, Вернёй-сюр-Сен, Францыя — 16.4.1859), французскі сацыёлаг, гісторык і паліт. дзеяч. У 1831—32 вывучаў пенітэнцыярную сістэму ў ЗША. З 1838 чл. Акадэміі маральных і паліт. навук, з 1841 — Франц. акадэміі. З 1839 чл. Палаты дэпутатаў, з 1848 — Устаноўчага, з 1849 — Заканад. (віцэ-старшыня) сходаў. Міністр замежных спраў (1849). Адзін з лідэраў кансерватыўнай Партыі парадку. У працах «Аб дэмакратыі ў Амерыцы» (1835), «Стары парадак і рэвалюцыя» (1856) аналізаваў супярэчнасці «дэмакр. рэвалюцыі», сутнасць і перспектывы дэмакратыі. Першая фаза развіцця дэмакратыі, на яго думку, — стварэнне абс. манархіі, у якой «знаць ужо зламана, а народ яшчэ не ўзняўся», у сувязі з чым уладары «цешацца паліт. стабільнасцю і ўсемагутнасцю». Рэвалюцыя, у т.л. і Франц. рэвалюцыя 1789—94, звяргае абсалютызм, адмяняе феад. прывілеі, зацвярджае трыумф эгалітарызму, але не пазбаўляе грамадства ад вынікаў абсалютызму, замяняе старую форму тыраніі дэмакр. дэспатызмам, а феад. няроўнасць — неабмежаваным панаваннем «іерархіі функцыянераў», якія складаюць «машыну кіравання». У гэтых умовах народ адхілены ад улады, ператвараецца ў аднародную масу, якая набывае скажоную форму роўнасці — «роўнасць у рабстве». У выніку ўзнікае індывідуалізм, які адхіляе людзей ад улады, ізалюе іх адзін ад аднаго і падштурхоўвае іх да прыватнага жыцця, у бок ад грамадскіх адносін і палітыкі. Каб абясшкодзіць грамадства ад новых форм дэспатызму, якія ствараюцца самім развіццём дэмакратыі, апорай свабоды павінна стаць, на думку Т., развіццё самасвядомасці і самакіравання, добраахвотных асацыяцый грамадзян, а таксама пашырэнне рэліг. перакананняў, якія па сваёй прыродзе несумяшчальныя з усеўладдзем дзяржавы і яго культам. *Я.М.Бабосаў.*

ТАКЕЛА́У (Tokelau), уладанне Новай Зеландыі на аднайм. астравах у цэнтр. частцы Ціхага ак., у Палінезіі. Пл. 10 км^2. Нас. 1,4 тыс. чал. (1998). Астравы заселены палінезійцамі. Адм. ц. на атоле Факаофа. Афіц. мова — англійская. Складаецца з 3 нізінных атолаў, што ўздымаюцца над узр. акіяна на 3—4 м. Паверхня складзена з абломкаў каралаў і каралавых пяскоў. Клімат трапічны, пасатны. Сярэднямесячныя т-ры 22—26 °С. За год выпадае каля 3000 мм ападкаў. У снеж.—сак. бываюць моцныя ўраганы. Астравы катастрафічна разбураюцца ад павышэння ўзроўню Сусв. акіяна. Натуральная расліннасць прадстаўлена пандануса м, какосавымі пальмамі, хмызнякамі. Шмат марскіх птушак. Мора багатае рыбай, ракападобнымі, малюскамі. Аснова эканомікі — натуральная і паўнатуральная сельская гаспадарка. Важнейшая с.-г. культура — какосавая пальма; копра — асн. прадмет экспарту. Вырошчваюць таксама тара, папайю, бананы. Свіна- і птушкагадоўля. Развіваецца рыбалоўства. Транспарт марскі. Ёсць аэрадром і пасадачныя пляцоўкі. У сувязі з прыроднай і эканам. нестабільнасцю прынята праграма паступовага перасялення жыхароў у Новую Зеландыю. Астравы атрымліваюць эканам. дапамогу ад Новай Зеландыі, Аўстраліі, ААН. Турызм. Грашовая адзінка — новазеландскі долар і сувенірная манета Такелау.

А-вы Т. заселены палінезійцамі з а-воў Самоа і Тонга ў 1-м тыс. н.э. Першы з а-воў Т. адкрыты ў 1765 англ. капітанам Дж.Байранам, апошні — у 1835. З 1877 пратэктарат Вялікабрытаніі, у 1916—26 ч. калоніі Астравы Гілберта і Эліс. У 1926 перададзены пад кіраванне Новай Зеландыі, фармальна замацаваны за ёй як «несамакіравальная тэрыторыя» ў 1948. У 1977 атрымалі самакіраванне.

ТАКІЙСКАЯ РАЎНІ́НА, другая назва раўніны *Канто.*

ТАКІЙСКІ ЗАЛІ́Ў, у Ціхім ак., каля паўд.-ўсх. ўзбярэжжа в-ва Хонсю (Японія). Даўж. каля 50 км, шыр. да 37 км, глыб. 15—30 м. Вузкім (да 9 м) прал. Урага злучаны з зал. Сагамі-Нада, а праз яго з Ціхім ак. Берагі нізінныя, густанаселеныя. Буйныя парты: Токіо, Іакагама, Іакосука, Кавасакі.

ТАКІЙСКІ ПРАЦЭ́С, судовы працэс над гал. яп. *ваеннымі злачынцамі* пасля 2-й сусв. вайны. Адбыўся 3.5.1946 — 12.11.1948 у Токіо ў *Міжнародным ваенным трыбунале* для Д. Усходу. Праведзены на падставе патрабаванняў *Патсдамскай дэкларацыі 1945* і Акта аб капітуляцыі Японіі ад 2.9.1945. Суду падлягала група з 28 дзярж. і ваен. дзеячаў Японіі, прыгавор вынесены адносна 25 з іх (2 падсудныя памерлі ў час працэсу, 1 прызнаны ў стане несвядомасці). У ходзе працэсу праведзены 818 адкрытых суд. пасяджэнняў, прыняты 4356 дакумент. доказаў і 1194 паказанні сведкаў. З 4.11.1948 зачытваўся прыгавор (1214 старонак). Падсудныя прызнаны вінаватымі ў тым, што на працягу 1928—45 планавалі, рыхтавалі і вялі агрэсіўныя войны супраць Кітая, СССР, ЗША, Вялікабрытаніі і інш. краін, арганізоўвалі ваен. злачынствы і злачынствы супраць чалавецтва (знішчэнне мірных жыхароў, забойствы і катаванні ваеннапалонных і інш.). Трыбунал прыгаварыў да пакарання смерцю 7 падсудных (павешаны ў Токіо ў ноч на 23.12.1948), да пажыццёвага зняволення 16, да 20 гадоў турмы — 11, да 7 гадоў зняволення — 1 падсуднага. Т.п., як і *Нюрнбергскі працэс*, садзейнічаў зацвярджэнню прынцыпаў і нормаў сучаснага міжнар. права ў галіне асуджэння дзярж. *агрэсіі.*

Літ.: Смирнов Л.Н., Зайцев Е.Б. Суд в Токио. М., 1978; Рагинский М.Ю. Милитаристы на скамье подсудимых: По материалам Токийского и Хабаровского процессов. М., 1985.

ТАКІЙСКІ УНІВЕРСІТЭ́Т, старэйшы і найбуйнейшы дзярж. ун-т Японіі. Засн. ў 1877. З 1886 Імператарскі ун-т, з 1897 Такійскі Імператарскі, з 1947 сучасная назва. У 1949 да яго далучаны Першая і Такійская вышэйшая школа. Больш за 15,5 тыс. студэнтаў і каля 11,5 тыс. аспірантаў (2002). Ф-ты: л-ры, адукацыі, права, эканомікі, навукі, медыцыны, фармакалогіі, с.-г., інжынерны. У складзе ун-та агульнаадук. каледж; лабараторыя касм. прамянёў, ін-ты: ядз. даследаванняў. фізікі цвёрдага цела, акіяналогіі, мед. навук, землетрасенняў, усх. культуры, сац. навук, журналістыкі, індустр. навук, гістарыяграфіі, прыкладной мікрабіялогіі.

ТАКЛА-МАКА́Н, пустыня на З Кітая, у цэнтр. ч. Кашгарскай раўніны; адна з буйнейшых пясчаных пустынь свету. Пл. 271 тыс. км^2. Даўж. з З на У больш за 1000 км, шыр. да 400 км. Пераважаюць выш. 800—1300 м, найб. выш. 1664 м (г. Чонгтаг). Б.ч. тэрыторыі ўкрыта пяскамі (месцамі магутнасцю да 300 м). Характэрны барханы, дзюны, замацаваныя ўзгоркі, на ўскраінах гліністыя ўчасткі з саланчакамі. Т.-М. з З і Пн агінае р. Тарым, у вільготныя гады перасякае р. Хатан. Клімат рэзка кантынентальны, сухі. Ападкаў да 100 мм за год. Моцныя вятры, пясчаныя буры. Б.ч. паверхні без расл. покрыва. У віль-

готных месцах — тамарыск, салянкі, сялітранкі, па далінах рэк — рэшткі тугайных таполевых лясоў, рэдкія аазісы.

М.В.Лаўрыновіч.

ТАКО́МА (Tacoma), горад на ПнЗ ЗША, штат Вашынгтон. 179,8 тыс. ж., з прыгарадамі каля 600 тыс. ж., з г.Сіэтл і агульнымі прыгарадамі каля 2,5 млн. ж. (1998). Порт у зал. П'юджэт-Саўнд. Прам-сць: каляровая (алюміній і медзь) і чорная металургія, суднабуд., суднаремонтная, дрэваапр., цэлюлозна-папяровая, хім., нафтаперапр., харч., металаапр., выт-сць прамысл. абсталявання. Цэнтр рыбалоўства.

ТА́КСА (ад лац. taxare ацэньваць), дакладна вызначаныя дзяржавай або органамі самакіравання расцэнкі тавараў ці ўзровень аплаты працы або паслуг.

ТА́КСАН (Tucson), горад у ЗША, гл. *Тусон.*

ТАКСАНО́МІЯ (ад грэч. taxis размяшчэнне, строй, парадак + nomos закон), тэорыя і практыка *класіфікацыі* і сістэматызацыі складанаарганізаваных абласцей рэчаіснасці; раздзел *сістэматыкі*. Тэрмін прапанаваны ў 1813 швейц. батанікам А.П.*Дэкандолем*. Асн. задача Т. — стварэнне рацыянальнага вучэння аб таксанамічных катэгорыях (рангах) і іх супадначалення (*іерархіі*), якое дазваляе пабудаваць прыродную класіфікацыю арганізмаў. Т. дае магчымасць адначасова ўлічваць вял. колькасць розных прыкмет. Т., сістэматыка і класіфікацыя звязаны паміж сабой, іх значэнні часта перакрываюцца.

ТАКСАПЛА́ЗМА (Toxoplasma), род паразітычных прасцейшых атр. какцыдый кл. спаравікоў. 1 від — Т. гондзіі (T. gondii). Паразіт млекакормячых жывёл, птушак і чалавека (канчатковыя гаспадары); узбуджальнік *таксаплазмозу*.

Даўж. 4—8, шыр. 2—4 мкм. Вегетатыўная форма рухомая, паўмесяцападобная. Жыццёвы цыкл характарызуецца чаргаваннем бясполага размнажэння (шызаганія) шляхам дзялення ў утварэннем цыст, псеўдацыст і палавога працэсу (гаметаганія). Развіццё з удзелам прамежкавых гаспадароў — больш за 180 відаў свойскіх і дзікіх жывёл. У млекакормячых і чалавека Т. можа перадавацца і праз плацэнту.

ТАКСАПЛАЗМО́З, прыродна-ачаговая хвароба чалавека і жывёл (больш за 180 відаў) з групы *заанозаў*. Выклікаецца ўнутрыклетачным паразітам з роду *таксаплазма*. Пры вострым цячэнні характарызуецца комплексам нерв. з'яў, паталогіяй цяжарнасці і родаў.

Інфекцыя перадаецца чалавеку (часцей ад сабак, катоў) паветрана-кропельным шляхам, праз страваальную сістэму, трансплацэнтарна і інш. Бывае Т. набыты і прыроджаны. Пры набытым Т. назіраюцца страта апетыту, слабасць, субфебрыльная (37,5 °С) т-ра. Прыроджаны вядзе да пашкоджання галаўнога мозга і запалення сасудзістай і сятчатай абалонак вачэй, да гібелі плода і нованароджанага, пачварнасці, затрымкі развіцця і інш. Лячэнне тэрапеўтычнае.

ТАКСАФО́Н, тэлефон-аўтамат, разнавіднасць *тэлефоннага апарата*, у якім злучэнне з выкліканым абанентам адбываецца пасля апускання манет пэўнай вартасці або спец. жэтона.

ТАКСА́ЦЫЯ ЛЕ́СУ (ад лац. taxatio ацэнка), комплекс тэхн. мерапрыемстваў з мэтай вызначэння, уліку і ацэнкі колькасных і якасных характарыстык *лясных рэсурсаў*. Асн. работы па Т.л. — перыядычнае *лесаўпарадкаванне*. Уключае метады і тэхналогіі вымярэння і мадэліравання асн. аб'ектаў уліку (лесапрадукцыі, асобных дрэў і іх сукупнасцей, лясных масіваў і інш.), для якіх з дапамогай таксацыйных паказчыкаў (запас і прырост насадак, сартыментная структура і інш.) складаецца таксацыйнае апісанне. Пры Т.л. ацэньваюцца і інш. лясныя прадукты (ігліца, лісце, ягады, грыбы, лек. і тэхн. сыравіна). Неабходна для рацыянальнага планавання і правядзення лесагасп. дзейнасці, *аховы прыроды*.



Цыкл развіцця і спосабы заражэння **таксаплазмай**: 1 — кошка-гаспадар, дзе праходзіць шызаганія і стадыя палавога цыкла; 2—4 — паслядоўныя стадыі развіцця аацысты; 5—6 — мышы-гаспадары, у якіх адбываецца дадатковае бясполае размнажэнне; 7 — унутрывантробнае заражэнне мышэй.

Літ.: Орлов М.М. Лесная таксация. 3 изд. Л., 1929; Захаров В.К. Лесная таксация. 2 изд. М., 1967; Анучин Н.П. Лесная таксация. 5 изд. М., 1982. *А.А.Малажаўскі.*

ТАКСІ́, таксаматор (ад франц. taxi), стандартны аўтамабіль з пэўнымі адрозненнямі (афарбоўка кузава, каляровы ліхтар, лічыльнік і інш.), прызначаны для перавозкі пасажыраў і грузаў з аплатай праезду паводле паказанняў лічыльніка. Упершыню Т. з'явіліся ў Лондане ў 1903, у Пецярбургу — у 1907, у Мінску — у 1912. На вызначаных маршрутах з пэўнымі інтэрваламі ад'езду з канцавых пунктаў і адначасовай аплатай за праезд ездзяць т. зв. маршрутныя Т.

ТАКСІДЭРМІ́Я (ад грэч. taxis будова + *дэрма*), выраб чучал жывёл. Скуру жывёлы напаўняюць мяккім матэрыялам (пакуллем, ватай) або нацягваюць яе на гатовую цвёрдую мадэль жывёлы. На Беларусі Т. займаюцца ў запаведніках, запаведна-паляўнічых гаспадарках, музеях і інш.

ТАКСІКАЛО́ГІЯ (ад грэч. toxikon яд + *...логія*), навука пра ўласцівасці *ядаў*, механізм іх дзеяння на арганізм, сутнасць выкліканага імі паталаг. працэсу (*атручэння*), метады яго лячэння і магчымасці ўжывання атрутных рэчываў у біялогіі і медыцыне. Адрозніваюць агульную і прыватную Т. Раздзелы Т.: клінічная, прамысл., с.-г., харч., судовая, радыяцыйная, ваен., авіяцыйна-касм. і інш. Цесна звязана з фармакалогіяй, паталаг. фізіялогіяй, эксперым. тэрапіяй. Метады даследавання: хім., біяхім., гістахім., цытахім. і інш.

Як навука ўзнікла ў сярэдзіне 19 ст. Заснавальнік Т. ў Расіі Я.В.Пелікан. На Беларусі даследаванні па Т. вядуцца з 1940-х г. у мед., вет., с.-г. ВНУ, Бел. н.-д. сан.-гігіенічным ін-це. Вывучаны таксікалагічныя ўласцівасці фосфарнаарганічных злучэнняў, распрацаваны сродкі эксперым. тэрапіі, рэкамендацыі па бяспецы, даследаваны таксічныя ўласцівасці новых палімераў, дэзінфектантаў і інш. хім. рэчываў, якія выкарыстоўваюць у прам-сці і сельскай гаспадарцы.

ТАКСІКАМА́НІЯ (ад грэч. toxikon яд + *манія*), цяга да пастаяннага прыёму таксічных рэчываў. Да Т. адносіцца *алкагалізм*, паталаг. станы, выкліканыя ўдыханнем лятучых таксічных рэчываў (напр., сінт. кляёў, фарбаў і інш.). Суправаджаецца развіццём хранічнай *інтаксікацыі*. Выклікае кароткачасовую *эйфарыю*, прыводзіць да псіхічных і саматычных парушэнняў (расстройствы дзейнасці сардэчна-сасудзістай сістэмы, печані, нырак і інш.), сац. дэградацыі асобы.

ТАКСІКО́З (ад грэч. toxikon яд), паталагічны стан, які развіваецца ў выніку паступлення таксічных рэчываў у арганізм звонку (экзатаксікоз) ці ўтварэння ў ім *таксінаў* пры захворваннях (эндатаксікоз). Экзатаксікоз атаясамліваецца з *атручэннем*, эндатаксікоз — з *аўтаінтаксікацыяй* (напр., пры *таксікозе цяжарнасці* — ірвота, слінацячэнне, дэрматозы і інш.). Адрозніваюць вострыя і

хранічныя Т. Вылучаюць формы: нейратаксікоз (першаснае пашкоджанне нерв. сістэмы) і Т. з эксікозам (абязводжваннем). Пры цяжкім Т. (напр., кішэчным) адбываюцца генералізаваныя расстройствы мікрацыркуляцыі, гіпаксія, ацыдоз і інш. Лячэнне: абясшкоджванне і выдаленне таксінаў і інш.

Т.М.Семяненя.

ТАКСІКО́ЗЫ ЦЯЖА́РНАСЦІ, паталагічныя станы, што ўзнікаюць пры *цяжарнасці* і ўскладняюць яе цячэнне. Адрозніваюць Т.ц. ранніе і познія. Раннія адзначаюцца ў першыя 12 тыдняў цяжарнасці (дрэннае самаадчуванне, моташнасць, ірвота, зрэдку слінацячэнне). Познія Т.ц. бываюць пасля 28 тыдняў цяжарнасці з выражанымі сасудзістымі парушэннямі — ацёкі (вадзянка цяжарных), гіпертанія, расстройствы функцыі нырак (нефрапатыя) і інш. Лячэнне комплекснае.

ТАКСІ́НЫ (ад грэч. toxikon яд), атрутныя рэчывы бялковага паходжання. Утвараюцца мікраарганізмамі, раслінамі і жывёламі. Валодаюць антыгеннымі ўласцівасцямі. Найб. вядомыя мікробныя Т., сярод якіх адрозніваюць экза- і эндатаксіны. Экзатаксіны (простыя бялкі) утвараюцца грамстаноўчымі патагеннымі бактэрыямі і выдзяляюцца ў навакольнае асяроддзе ў час іх росту, таксама некат. грамадмоўнымі бактэрыямі. Некат. з іх выклікаюць слупняк, батулізм, дыфтэрыю і інш. захворванні. Эндатаксіны (складаныя бялкі — комплексы ліпаполіцукрыдаў з бялкамі) знаходзяцца ў вонкавых слаях клетачных сценак патагенных грамадмоўных бактэрый. Іх Т. выдзяляюць узбуджальнікі брушнога тыфу, дызентэрыі і інш. Т. ёсць у ядах змей, пчол, некат. павукоў і скарпіёнаў. Т. расл. паходжання (*фітатаксіны*) — рыцын (з насення клешчавіны) і абрын (з абрусу). Кожны Т. дзейнічае на пэўную тканку (напр., Т. батулізму на нерв. клетку). З Т. атрымліваюць неатрутныя *анатаксіны*, якія стымулююць імунітэт, выпрацоўваюць антыбіётыкі.

ТА́КСІСЫ (ад грэч. taxis размяшчэнне), найпрасцейшыя рухальныя рэакцыі ў адказ на раздражненне. Уласцівы арганізмам, якія свабодна перамяшчаюцца (бактэрыі, некат. грыбы і водарасці, жывёлы), некат. асобным рухомым клеткам і арганоідам (гаметы і споры са жгуцікамі, лейкацыты, хларапласты).

Крыніцы раздражнення — святло (фататаксіс), т-ра (тэрматаксіс), эл. ток (гальванатаксіс), вільгаць (гідратаксіс), хім. рэчывы (хематаксіс). Рух накіраваны да крыніцы стымуляцыі (дадатны Т.), або ад яе (адмоўны Т.). Адрозніваюць ненакіраваныя змены курсу руху (фобатаксісы), уласцівыя бактэрыям, зааспорам некат. фікаміцэтаў, і накіраваныя перамяшчэнні да крыніцы раздражнення (топатаксісы), характэрныя для сперматазоідаў імхоў, папарацей. Жгуцікавым водарасцям уласцівы абодва тыпы Т. У жывёл Т. наз. толькі накіраваныя рухі да стымулу перамяшчэння (ненакіраваныя рухі наз. кінезамі), напр., міграцыі, арыентацыя па сонцы ў жывёл і інш. Т. адрозніваюцца ад *трапізмаў*. Гл. таксама *Рух* у біялогіі, *Рэфлексы*.

ТАКСІ́ЧНЫЯ ВО́ДАРАСЦІ, водарасці, здольныя выпрацоўваць *таксіны* (альгатаксіны). Таксічныя ўласцівасці вядомы ў некалькіх дзесяткаў відаў сіне-зялёных і дынафітавых, некат. родаў залацістых і зялёных водарасцей. Таксіны марскіх дынафітавых водарасцей, якія выклікаюць «чырвоныя прылівы» каля берагоў Канады, Вялікабрытаніі, Японіі, у трапічных і субтрапічных зонах акіянаў і мораў, належаць да нейратаксінаў і паводле ўздзеяння нагадваюць яд *курарэ*. Таксіны сіне-зялёных водарасцей адносяць да моцных парэнхіматозных ядаў (С-фікацыянін). Звычайны для вадаёмаў Беларусі мікрацыстіс сінявата-зялёны мае таксін, які па біял. уздзеянні і хім. уласцівасцях блізкі да тэрмастабільнага яду бледнай паганкі. Інтаксікацыя вады прыводзіць да атручэння дзікіх і свойскіх жывёл, птушак. У некат. людзей пры кантакце з таксічнымі водарасцямі ўзнікаюць алергіі, кішэчна-страўнікавыя расстройствы, пры ўжыванні вады ў час «цвіцення» або рыбы з такога вадаёма — *таксікозы*.

Т.М.Міхеева.

ТАКСО́БНАСЦЬ (ад грэч. toxikon яд), здольнасць арганізмаў існаваць у водах, якія ўтрымліваюць таксічныя рэчывы мінер. ці арган. паходжання. Вылучаюць полі-, меза- і алігатаксобныя арганізмы, якія вытрымліваюць адпаведна моцную, сярэднюю і слабую ступень таксічнай забруджанасці. Вадаёмы ці іх зоны, у якіх з-за забруджанасці адсутнічаюць жывыя арганізмы, наз. гіпертаксобнымі.

ТА́КСЫ (ад ням. Dachshund барсуковы сабака), група парод паляўнічых і дэкар.-пакаёвых сабак. Вядомы з глыбокай старажытнасці. Сучасныя пароды цяжкія, сярэднія, карлікавыя сфарміраваліся ў сярэдзіне 18 ст. ў Германіі. Пашыраны па ўсім свеце. Выкарыстоўваюцца для палявання на норных звяроў (лісоў, барсукоў і інш.).



Таксы: 1 — гладкашэрсная; 2 — шорсткашэрсная; 3 — даўгашэрсная.

Канстытуцыя моцная, сухая. Выш. ў карку 16—27 см. Тулава выцягнутае. Ногі кароткія. Галава клінападобная. Вушы абвіслыя. Бываюць гладкашэрсныя (шэрсць даўж. да 2 см, шорсткая, прылеглая), даўгашэрсныя (шэрсць з развітым падшэрсткам, доўгая, мяккая) і шорсткашэрсныя (шэрсць даўж. каля 3 см, прамая, шорсткая, густая, прылеглая, утварае «бровы», «вусы», «бараду»). Масць рыжая, карычневая, чорная, шэрая з падпалінамі. Хвост шаблебападобны. Тып паводзін ураўнаважаны — рухомы.

ТАКТ (франц. tact ад лац. tactus дотык, адчуванне), пачуццё меры, якое падказвае найб. правільны падыход, найб. далікатную лінію паводзін ў адносінах да каго-н., чаго-н.; уменне трымаць сябе належным чынам. Т. наз. таксама рытм якога-н. руху, дзеяння.

ТАКТ у музыцы, адзінка муз. *метра*. У адпаведнасці з тыпамі метра адрозніваюць Т. простыя (2- ці 3-дольныя), складаныя (4-, 6-, 9-, 12-дольныя), мяшаныя (напр., 5-дольныя). 1-я доля Т. — моцная; у складаных вылучаюць і т. зв. адносна моцную долю. Структура Т. адлюстроўваецца ў памеры: межы Т. ў нотным пісьме абазначаюцца верт. лініямі (тактавымі рысамі).

ТАКТАВІ́К, від танічнага верша (гл. *Танічнае вершаскладанне*), у якім колькасць складоў паміж моцнымі націскнымі складамі (*іктамі*) ад 0 да 3—4. Пропускі націскаў на метрычна моцных месцах рэдкія, а ў 3-складовых інтэрвалах часта сустракаюцца звышсхемныя націскі на сярэднім складзе. Т. займае прамежкавае становішча паміж *дольнікам* і акцэнтным вершам (аднолькавая або прыблізна аднолькавая колькасць акцэнтаў — апорных рытмічных націскаў у вершаваных радках). У бел. паэзію Т. увялі ў пач. 20 ст. Я.Купала і М.Багдановіч. Прыклад 4-іктнага Т. ў Я.Купалы:

Я табе́, зямля́ мая пра́дзедаў маіх,
Не патра́плю нічо́га жале́ць на све́це,
На свет цэ́лы гато́ў твой прыго́н апе́ці
І ўзнясці́ пасад на магі́лішчах тваіх.

(«Для зямлі прадзедаў маіх...»)

В.П.Рагойша.

ТАКТАГУ́Л САТЫЛГА́НАЎ (25.10.1864, кішлак Кушчусу Тактагульскага р-на Джалал-Абадскай вобл., Кіргізія — 17.2.1933), кіргізскі народны акын і кампазітар, музыкант-віртуоз (выканаўца на камузе). З маленства складаў песні, выконваў і нар. муз.-інстр. творы. За песні выкрывальніцкага сац. зместу ў 1898 асуджаны да пакарання смерцю. Прыгавор заменены ссылкай у Сібір, адкуль у 1910 уцёк. Найб. вядомы яго сатыр. песні «Ішан і яго паслядоўнік»,

«Пяць манапаў», вершы «Бывай, мой народзе!», «Бывай, маці!». У Кіргізіі ўстаноўлена дзярж. прэмія яго імя.

Тв.: Рус. пер. — Избранное. Фрунзе, 1964.

Літ.: Маленов Б. Великий акын-демократ. Фрунзе, 1964.







Тактагул Сатылганаў.

А.В.Тактакішвілі.

Р.А.Такуеў.

ТАКТАГУ́ЛЬСКАЕ ВАДАСХО́ВІШЧА. На р. Нарын, у Кіргізіі. Утворана плацінай аднайм. ГЭС. Запаўнялася з 1973. Пл. 284 км^2, аб'ём 19,5 км^3, даўж. 65 км, найб. шыр. 12 км. Штогадовае рэгуляванне сцёку; праектная ваганне ўзроўню вады да 63 м. Выкарыстоўваецца для мэт энергетыкі і ірыгацыі.

ТАКТАКІШВІ́ЛІ Атар Васілевіч (27.7.1924, Тбілісі — 19.11.1989), грузінскі кампазітар, педагог, дзярж. дзеяч. Нар. арт. Грузіі (1961). Нар. арт. СССР (1974). Скончыў Тбіліскую кансерваторыю (1947), у 1947—69 і з 1984 выкладаў у ёй (з 1966 праф.). З 1947 канцэртмайстар і дырыжор, у 1952—56 дырыжор і маст. кіраўнік Дзярж. хар. капэлы Грузіі. У 1965—84 міністр культуры Грузіі. Найб. значныя дасягненні ў оперным, кантатна-аратарыяльным і сімф. жанрах. Сярод твораў: оперы «Міндыя» (па матывах паэзіі Важа Пшавела, паст. 1961), «Выкраданне Месяца» (паст. 1977), «Першае каханне» (паст. 1980); араторыі, у т.л. «Па слядах Руставелі» (1964); кантата «Гурыйскія песні» (1971); вак.-сімф. сюіты, у т.л. «Мегрэльскія песні» (1972) і «З лірай Цэрэтэлі» (1983); 2 сімфоніі (1949, 1953); сімф. паэма «Мцыры» (1956); тв. для інстр. з арк., хоры, рамансы, музыка для драм. т-раў, кінафільмаў і інш. Аўтар музыкі Дзярж. гімна Грузінскай ССР (1946). На сцэне Дзярж. т-ра оперы і балета Беларусі паст. «Міндыя» (1973). Ленінская прэмія 1982. Дзярж. прэміі СССР 1951, 1952, 1967. Дзярж. прэмія Грузіі 1987.

Літ.: Полякова Л. О.Тактакишвили. 2 изд. М., 1979. *Т.А.Дубкова.*

ТА́КТЫКА ваенная (грэч. taktika мастацтва пастраення войск), тэорыя і практыка падрыхтоўкі і вядзення бою падраздзяленнямі, часцямі (караблямі) і злучэннямі; састаўная частка *ваеннага майстэрства*. Тэорыя Т. даследуе заканамернасці, характар і змест бою, распрацоўвае спосабы яго падрыхтоўкі і вядзення. Практыка Т. ўключае падрыхтоўку войск, планаванне, забеспячэнне і вядзенне баявых дзеянняў, кіраванне падраздзяленнямі і часцямі ў баі і інш. Асн. фактары, якія вызначаюць развіццё Т.: удасканаленне зброі і ваен. тэхнікі; якасці асабовага складу (узровень адукацыі, баявыя традыцыі, нац. асаблівасці і інш.); характар аператыўнага майстэрства і стратэгіі ваеннай.

Са стараж. часоў да пач. 20 ст. Т. фактычна адлюстроўвала развіццё *Сухапутных войск* і *Ваенна-Марскога Флоту*. У войнах рабаўладальніцкіх дзяржаў Т. зводзілася да прамалінейнага руху войск у ходзе баёў і рукапашных схваткаў. У гэты перыяд яна развівалася ў кірунку ўдасканалення баявых парадкаў войск і манеўравання імі (гл. *Манеўр*). Вынаходства новых відаў зброі прывяло да з'яўлення розных відаў *пяхоты* і *кавалерыі*, абумовіла неабходнасць узаемадзеяння паміж імі. З пач. 11 ст. ў Зах. і Цэнтр. Еўропе Т. вызначалася панаваннем на палях бітваў рыцарскай конніцы (гл. *Рыцарскае войска*). У 13 ст. найб. гнуткай Т. валодалі мангола-татары, якія атрымалі шэраг буйных перамог у войнах супраць многіх дзяржаў і народаў Азіі і Еўропы (гл. *Мангольскія завяванні*). Прыкладамі ўзорнай Т. ўсх. славян у 13—14 ст. з'яўляюцца *Лядовае пабоішча 1242*, *Бітва каля Сініх Вод 1362*, *Кулікоўская бітва 1380* і інш. Далейшае развіццё Т. звязана з выкарыстаннем *агнястрэльнай зброі*. У 16—17 ст. найб. характэрнымі рысамі тактычнага майстэрства, у т.л. ў войску ВКЛ, з'яўляліся манеўр і рухомасць, раптоўнасць нападу, спалучэнне франтальных удараў з фланговымі і тылавымі, а таксама засадамі, камбінаванне розных відаў узбраення, пераслед адыходзячага непрыяцеля з мэтай яго знішчэння або захопу ў палон і інш. Да гэтага перыяду адносіцца росквіт тактычнага майстэрства шэрагу таленавітых военачальнікаў ВКЛ: М.*Глінскага* (*Клецкая бітва 1506*), К.*Астрожскага* (*Аршанская бітва 1514*), М.*Радзівіла* (*Ульская бітва 1564*), Я.К.*Хадкевіча* (*Кірхгольмская бітва 1605*), Я.*Радзівіла* (*Лоеўская бітва 1649* і *Лоеўская бітва 1651*) і інш. З 17 ст. змяненне ў Т., звязанае з наяўнасцю вял. колькасці агнястрэльнай зброі, выявілася ў адмове ад глыбокіх баявых парадкаў, выцягванні войск уздоўж фронту з мэтай максімальнага выкарыстання зброі і змяншэння страт сваіх войск (лінейная Т. і інш.). Стварэнне масавых армій у канцы 18 — пач. 19 ст. і далейшае ўдасканаленне зброі прывялі да калоннага пастраення войск і рассыпнога строю. Са з'яўленнем у 2-й пал. 19 ст. *наразной зброі* пяхота пры наступленні ўтварала стралк. ланцугі. У 1-ю сусв. вайну ў сувязі з масавым выкарыстаннем *кулямётаў*, наразной артылерыі, з паяўленнем *танкаў*, *авіяцыі* і *атрутных рэчываў* пачала складвацца Т. агульнавайск. бою, зарадзілася Т. авіяц., інж. і хім. войск, адпрацоўваліся спосабы выкарыстання танкаў і *бронеаўтамабіляў*. У 1914—15 склаўся новы баявы парадак — «хваля ланцугоў». У 2-ю сусв. вайну выкарыстанне перадавой Т. садзейнічала перамозе Узбр. Сіл СССР і армій саюзнікаў у вайне. Значны ўклад у Перамогу зрабіла партыз. армія Беларусі. Партыз. фарміраванні выкарыстоўвалі розныя тактычныя спосабы, прыёмы і формы баявых дзеянняў: *«рэйкавую вайну»*, засады, нечаканыя налёты і напады, абарончыя баі з мэтай утрымання цэлых раёнаў і процідзеяння ням. Т. *«выпаленай зямлі»* і інш.

Істотныя змены ў тэорыі і практыцы Т. адбываліся з сярэдзіны 1950-х г. у сувязі з аснашчэннем войск шэрагу дзяржаў *стратэгічным узбраеннем*. *Маланкавыя войны* і інш. сучасныя формы узбр. процідборства абумовілі далейшае развіццё Т. відаў узбр. сіл, Т. родаў войск (сіл флоту), Т. спец. войск і агульнай Т. Змены ў стратэгіі і Т. сучасных баявых (спец.) дзеянняў адпрацоўваліся на шэрагу вучэнняў з удзелам падраздзяленняў і часцей Узбр. Сіл і інш. войск і вайск. фарміраванняў Рэспублікі Беларусь (комплексныя аператыўна-тактычныя вучэнні «Нёман-2001», «Бярэзіна-2002» і інш.).

Літ.: Тактика. М., 1966; Общая тактика. Ч. 1. М., 1976; Петрусь П.М., Шеманский П.В., Чульский Н.К. Ядерное оружие и развитие тактики. М., 1967; Гришин С.В., Жуков П.А., Китошвили Ш.И. Тактика: (По иностр. взглядам). М., 1972; Воробьев И.Н. О тактике // Воен. мысль. 2002. № 1—5.

С.А.Фамін, В.А.Юшкевіч.

ТАКУГА́ВА, дынастыя правіцеляў (*сёгунаў*) Японіі ў 1603—1868. Засн. Такугава Іэясу, які з захопам улады скончыў міжусобныя войны (15—16 ст.). Для ўмацавання дзяржавы сёгуны Т. ажыццявілі ў 1-й пал. 17 ст. шэраг рэформ: рэгламентавалі правы і абавязкі кожнага саслоўя, усталявалі кантроль над князямі (даймё) і г.д. З 1630-х г. урад Т. ажыццяўляў палітыку ізаляцыі Японіі ад знешняга свету. З канца 18 ст. дзяржава Т. перажывала ўнутр. крызіс, выкліканы ростам насельніцтва і сялян і прывілеяванага саслоўя — *самураяў*. Прымусовае «адчыненне» краіны еўрап. дзяржавамі ў 1854—58 паглыбіла крызіс. У маі 1868 апошні сёгун Т. — Кэйкі скінуты ў выніку руху за аднаўленне ўлады імператара — *Мэйдзі Ісін*.

ТАКУ́ЕЎ Рыгор Аркадзевіч (23.12.1917, в. Паташаўка Архангельскай вобл., Расія — 9.10.1995), удзельнік партыз. руху ў Палескай вобл. ў Вял. Айч. вайну, Герой Сав. Саюза (1944). Удзельнік сав.-фінл. вайны 1939—40. У Вял. Айч. вайну з 1941 на фронце, з чэрв. 1942 у партызанах, камандзір падрыўной групы, са жн. 1943 дыверсійнага атрада 125-й Капаткевіцкай партыз. брыгады. На чале з ім партызаны пусцілі пад адхон 55 варожых эшалонаў, з іх асабіста Т. — 19. Да 1980 на кіруючай рабоце ў спарт. т-ве «Спартак».

ТАКУСІ́МА, горад у Японіі, на ПнУ в-ва Сікоку. Адм. ц. прэфектуры Такусіма. Каля 300 тыс. ж. (2001). Марскі порт. Прам-сць: маш.-буд., хім., дрэваапр., харч., паліграфічная. Традыц. нац. рамёствы (лакавыя вырабы). Ун-т.

ТАКЫ́РЫ (ад цюрк. такыр — роўны, голы), плоскія гліністыя паніжэнні ў пустынях і паўпустынях Сярэдняй Азіі і Казахстана. Вясной і летам пасля дажджу на Т. утвараюцца часовыя неглыбокія азёры. Летам яны пакрываюцца скарынкай, якая разбіваецца трэшчынамі ўсыхання на асобныя мнагагранікі (6—12 см у папярочніку). Расліннасць рэдкая палынна-салянкавая ці адсутнічае.

ТА́ЛАВАЕ МА́СЛА, сумесь арган. злучэнняў, атрыманая пры перапрацоўцы сульфатнага мыла — дадатковага прадукту сульфатнай варкі *цэлюлозы*.

Найб. пашырана Т.м. з хвоі — цёмна-рудая вадкасць, шчыльн. 994—1001 кг/м^3. Не растваральнікаў. Асн. кампаненты — *смаляныя кіслоты* (40—45%) і вышэйшыя ненасычаныя *тлустыя кіслоты* (прыкладна 40%), пераважна алеінавая, лінолевая і ліналенавая, мае таксама нейтральныя рэчывы (да 20%). Т.м. з драўніны лісцевых парод смаляных кіслот не мае. Солі кіслот Т.м. наз. талатамі. Выкарыстоўваюць Т.м. як сыравіну для атрымання *каніфолі* і вышэйшых аліфатычных кіслот, Т.м. з драўніны лісцевых і сумесі хваёвых і лісцевых парод як флотарэагент, кампанент змазачна-ахаладжальных вадкасцей.

ТАЛА́Й, з а я ц - т а л а й, млекакормячае сям. зайцавых, гл. ў арт. *Зайцы*.

ТАЛАКА́, у беларусаў і інш. слав. народаў даўні нар. звычай калектыўнай дапамогі ў гасп. работах. Звычайна на адзін дзень запрашалі сваякоў, суседзяў, аднавяскоўцаў для тэрміновай ці працаёмкай работы, якая вымагала многа работнікаў і цягла: зрубіць хату, скасіць сена, зжаць жыта, выбраць бульбу, вывезці лес, гной на поле і інш. Памагалі найперш пагарэльцам, удовам, салдаткам, бясконным. Т. звычайна заканчвалася застоллем, спяваннем *талочных песень*.

У Т. выяўляюцца рысы стараж. калектывізму і рэшткі абшчыннага побыту. У час прыгону паны выкарыстоўвалі нар. звычай і ўводзілі прымусовыя Т. для выканання тэрміновых с.-г. работ звыш абавязковых сялянскіх павіннасцей, т.зв. *згоны*.

«ТАЛАКА́», маладзёжнае гісторыка-культурнае аб'яднанне. Існавала ў 1985—91 у Мінску. Аб'ядноўвала каля 50 членаў, якія ўдзельнічалі ў рэстаўрацыі помнікаў і археал. раскопках у Мінску, Мінскім, Маладзечанскім і інш. раёнах, адраджэнні бел. рэліг. абшчын (неаязычніцкай, уніяцкай, каталіцкай, праваслаўнай), выступалі за шырокае выкарыстанне бел. мовы ў паўсядзённым жыцці, стварэнне ў гарадах бел. школ, арганізоўвалі дыскусіі і асв. лекцыі па пытаннях нац. гісторыі і сімволікі, захаванні арх. помнікаў; праводзілі краязн. экскурсіі, фалькл. святы, літ.-маст. вечарыны і інш. Спыніла існаванне ў сувязі з пераходам большай часткі членаў у інш. грамадскія арг-цыі.

С.У.Вітушка.

«ТАЛАКА́», бел. ансамбль танца, музыкі і песні Віцебскай абл. філармоніі. Створаны ў 1993. Арганізатар, маст. кіраўнік і гал. балетмайстар М.Падаляк, хормайстар А.Падаляк, муз. кіраўнік В.Сіўцова. У складзе ансамбля харэаграфічная (12 чал.), вак. (6 чал.) і інстр. (7 чал.) групы. У аснове рэпертуару бел. нар. танцы, танцы народаў свету, бел. нар. песні ў апрацоўцы У.Зіневіча, А.Кашпура, А.Рашчынскага, М.Сіраты. Сярод пастановак: бел. нар.-сцэнічныя танцы «Ойра», «Закаблукі», «Вясковы вальс», «Брылі», «Баравенічкі», «Крупчанская кадрыль», «Прыдзвінскія забавы»; харэаграфічныя замалёўкі «Бабылі», «Межанская прабегліца»; бел. нар. песні, інстр. найгрышы «Стрыкач», «Драбавец», «Полька дзедава», «З рога ўсяго многа» і інш.



Ансамбль **«Талака»**.

ТАЛАКНО́, даўняя страва з аўса, вядомая многім народам. Беларусы зерне аўса спачатку парылі ў печы, потым сушылі, абтоўквалі ў ступе, палалі ў начоўках, малолі ў жорнах, прасейвалі. Перад спажываннем дробныя крупы размочвалі ў халоднай вадзе. На ПнЗ Беларусі Т. замешвалі большай колькасцю вады і елі лыжкамі. На Віцебшчыне, Лоеўшчыне Т. называлі прыгатаваную такім чынам муку. У зах. і паўн.-зах. гаворках мае назву мілта.

Г.Ф.Вештарт.

ТАЛАКНЯ́НКА (Arctostaphylos), род кветкавых раслін сям. верасовых. Каля 70 (паводле інш. звестак больш за 30) відаў. Пашыраны ва ўмераным і арктычным паясах Паўн. паўшар'я, пераважна ў Паўн. Амерыцы. На Беларусі 1 від — Т. звычайная, або мядзведжае вушка, ці мядзведжая ягада (A. uva-ursi), падобная на брусніцы. Трапляецца ў хваёвых лясах на пясчанай глебе, утварае рыхлыя дзярніны.

Вечназялёныя распасцёртыя кусцікі з моцна галінастымі стволікамі. Парасткі доўгія, галінастыя. Лісце чаргаванае, скурыстае, бліскучае, суцэльнакрайняе. Кветкі ружовыя, у верхавінкавых, паніклых, аднабаковых гронках. Плод — чырв. мучністая ягада, корм для мядзведзяў і некат. птушак. Лек., дэкар., дубільныя, фарбавальныя расліны.

А.М.Скуратовіч.





Талакнянка звычайная.

«ТАЛАКУ́ХА», старажытны бел. нар. танец; называлі таксама «Талака» (ад звычаю «граць талаку» — весяліцца, спяваць і танцаваць пасля заканчэння *талакі*). Муз. памер 2/4. Тэмп умераны. Асн. рух танца «талачэнне» — таптанне на месцы з рознымі рытмічнымі прытупамі і драбушкамі. Дзяўчаты ўтваралі паўкруг, тупалі нагамі і падскоквалі, не сыходзячы з месца, размахвалі хусткамі. Саліравала дзяўчына, што стаяла спераду; па ходу танца яна трапляла ў цэнтр круга і запявала. Выконваўся на *дажынках*. Імітаваў талаку. Зафіксаваны ў 1-й пал. 19 ст. *Л.К.Алексютовіч.*

ТАЛАЛА́Й Леў Барысавіч (1906, Магілёўшчына — 1942), яўрэйскі паэт. Вучыўся ў Віцебскім пед. тэхнікуме (1926—28). З 1932 супрацоўнік яўр. газ. «Юнкер Арбайтэр» («Малады рабочы»), з 1936 настаўнічаў у Мінску. Загінуў на фронце ў Вял. Айч. вайну. Друкаваўся з 1924. Пісаў на яўр. і бел. мовах. Аўтар паэт. зб-каў «Мой першы сноп» (1932), «У паходзе» (1940) пра жыццё вёскі, баявыя будні байцоў. На бел. мову асобныя яго вершы пераклалі А.Бялевіч, Р.Няхай.

Літ.: Р э л е с Р. Леў Талалай // Мы іх не забудзем. Мн., 1949; Леў Талалай // Радзіме — радок і жыццё. Мн., 1986.

ТАЛАЛІ́ХІН Віктар Васілевіч (18.9.1918, с. Цяплоўка Вольскага р-на Саратаўскай вобл., Расія — 28.10.1941), лётчык-знішчальнік. Герой Сав. Саюза (1941). Скончыў Барысаглебскую ваен. авіяц. школу лётчыкаў (1938). Удзельнік сав.-фінл. вайны 1939—40. У Вял. Айч. вайну камандзір звяна, нам. камандзіра эскадрыллі. У 1941 упершыню здзейсніў *таран* у начным паветр. баі, знішчыў бамбардзіроўшчык ворага на подступах да Масквы. У наступных баях збіў яшчэ 5 самалётаў праціўніка. Загінуў у баі.

ТАЛА́МУС зрокавыя бугры, частка *прамежкавага мозга*, парныя збіранні шэрага рэчыва, якія ўтвараюць бакавыя сценкі 3-га жалудачка; гал. падкоркавы цэнтр інтэграцыі *адчувальнасці*. У ніжэйшых пазваночных забяспечвае ажыццяўленне рэфлексаў. Развіццё Т. звязана з фарміраваннем кары вял. паўшар'яў *галаўнога мозга*. У Т. чалавека вылучаюць каля 60 ядраў (спецыфічных і неспецыфічных). Мае некалькі функцыян. зон, звязаных са сваёй коркавай вобласцю. Т. вентральны мае сярэдзінныя, медыяльныя, вентралатэральныя і заднія ядры; дарсальны — пярэднія, медыяльнае і дарсальнае, перадпокрыўныя ядры. Вылучаюць функцыян. класы гэтых ядраў: спецыфічныя ядры скураных сенсорных органаў, вока і вуха (пераключальныя структуры саматычных і вісцэральных сістэм); ядры з пераважна рухальнымі функцыямі (звязваюць мазжачковыя і базальныя ганглії з рухальнай карою); ядры з асацыятыўнымі функцыямі, таксама неспецыфічныя ядры (павышаюць узбуджальнасць коркавых нейронаў і здольнасць да адказаў на паступаючыя імпульсы). *А.С.Леанцюк.*

ТАЛА́НКІН Ігар (Індустрый) Васілевіч (н. 3.10.1927, г. Нагінск Маскоўскай вобл.), расійскі кінарэжысёр, педагог. Нар. арт. Расіі (1974). Нар. арт. СССР (1988). Скончыў Дзярж. ін-т тэатр. мастацтва (1956), Вышэйшыя рэжысёрскія курсы (1959). У 1964—89 кіраўнік рэжысёрскіх майстэрняў Усесаюзнага дзярж. ін-та кінематаграфіі (з 1976 праф.). Паставіў фільмы «Сярожа» (з Г.Данелія, 1960, гал. прыз Міжнар. кінафестывалю ў Карлавых Варах), «Уступ» (1963, спец. прыз Міжнар. кінафестывалю ў Венецыі), «Дзённыя зоркі» (1968), «Чайкоўскі» (1970), «Выбар мэты» (1976), «Айцец Сергій» (1978), «Зарапад» (1982), «Час адпачынку ад суботы да панядзелка» (1984), «Восень, Чартанава» (1988), «Д'яблы» (1992), «Нябачны вандроўнік» (1998).

ТАЛА́ПІН Віталь Іванавіч (н. 15.2.1935, г. Ржэў Цвярской вобл., Расія), бел. вучоны ў галіне фармакалогіі. Д-р мед. н. (1973). Скончыў Мінскі мед. ін-т (1959), дзе працаваў да 1972. З 1972 у БелНДІ санітарыі і гігіены (нам. дырэктара). Навук. працы на комплексным вывучэнні фармакалогіі энтэрахрамафіннай клетачнай сістэмы.

Тв.: Состояние энтерохромаффинных клеток при стрессе (разам з Т.А.Вылегжанінай) // Здравоохранение Беларуси. 1968. № 6.

ТАЛАСАКРАТО́Н (ад грэч. thalassa мора + kratos сіла, магутнасць), устойлівая або малярухомая вобласць ложа акіянаў, у межах якой развіты абісальныя раўніны. Тэрмін уведзены аўстр. геолагам Р. Фейрбрыджам у 1955. Найб. стараж. Т. Ціхага і ўсх. ч. Індыйскага акіянаў, якія існуюць, магчыма, з дакембрыю; менш стараж. — зах. ч. Індыйскага, Атлантычнага і Паўн. Ледавітага акіянаў, якія, верагодна, утварыліся ў палеазоі — мезазоі. У складзе Т. вылучаюць акіянічныя пліты або монакратоны, сярэдзіннаакіянічныя хрыбты, унутрыкратонныя і перыкратонныя валы, вузкія глыбавыя хрыбты горставаго тыпу, доўгія зоны разломаў (паводле тыпу аўлакагенаў мацерыковых платформ) і вулканічныя збудаванні. У канцэпцыі «новай глабальнай тэктонікі» (або тэктонікі пліт) складаюць ч. пліт *літасферы*.

ТАЛАСАКРАТЫ́ЧНЫЯ ПЕРЫ́ЯДЫ, перыяды ў гісторыі Зямлі, калі значна пашыралася плошча мораў (трансгрэсіі). Супадаюць з сярэдзінай тэктанічных цыклаў, калі на б. ч. зямной паверхні пераважалі апусканні. Проціпастаўляюцца *геакратычным перыядам*. Да ліку Т.п. адносяць сілур, сярэдні і позні дэвон, ранні карбон, позні мел. Павелічэнне плошчы гідрасферы садзейнічала развіццю вільготнага марскога клімату з малымі ваганнямі т-ры. У гэты перыяд намнажаліся пераважна марскія асадкавыя тоўшчы, б. ч. якіх складалі карбанатныя пароды.

ТАЛАСАТЭРАПІ́Я (ад грэч. thalassa мора + *тэрапія*), комплекснае лячэнне марскім кліматам і марскімі купаннямі, від *клімататэрапіі*. Загартоўвае арганізм, трэніруе механізмы тэрмарэгуляцыі, станоўча ўздзейнічае на нерв., сардэчна-сасудзістую, мышачную, дыхальную сістэмы, паляпшае абмен рэчываў, павялічвае спажыванне кісларoду і інш. Паказанні: захворванні нерв., сардэчна-сасудзістай, дыхальнай сістэм, парушэнні абмену рэчываў і інш.

І.М.Семяненя.

ТАЛА́СКАЯ ДАЛІ́НА, міжгорная катлавіна ў Кіргізіі, на Пн Цянь-Шаня, паміж хрыбтамі Кіргізскі Алатау і Таласкі Алатау. Даўж. каля 250 км, пераважаюць выш. 600—2000 м. Цячэ р. Талас. Складзена са сланцаў, пясчанікаў, вапнякоў; ёсць інтрузіі граніту. Пераважаюць паўпустынныя, сухастэпавыя і стэпавыя ландшафты, каля рэк аазісныя землі. У ніжнім цячэнні р. Талас пабудавана плаціна і вадасховішча для арашэння прылеглых зямель. У Т.д. — г. Талас.

ТАЛАСО́ІД (ад грэч. thalassoeidēs падобны на мора), буйное кальцавое ўтварэнне на паверхні Месяца. Па памерах блізкае да круглых т. зв. месяцавых мораў. Паводле альбеда і структуры парод, што ўкрываюць яго паверхню, падобнае на месяцавы мацярык.

ТАЛА́Т-КЯЛПША́ (Talat-Kełpša) Юозас Антана (1.1.1889, в. Калнуяй Каўнаскага пав., Літва — 5.2.1949), літоўскі кампазітар, дырыжор, педагог, муз. дзеяч. Засл. дз. маст. Літвы (1945). Скончыў Петраградскую кансерваторыю (1916). З 1920 выкладаў у муз. вучылішчы, з 1933 — у Каўнаскай кансерваторыі (з 1948 праф.). Адначасова з 1920 адзін з арганізатараў (разам з К.*Пятраўскасам*) і дырыжор Каўнаскага опернага т-ра. Адзін з пачынальнікаў літ. раманса. Сярод твораў: опера «Дачка старшыні» (1938, не завершана), кантаты, тв. для арк., камерныя і вакальныя творы, хары, песні, а таксама запісы (больш за 700) і апрацоўкі літ. і бел. нар. песень. Дзярж. прэмія СССР 1948.

ТАЛАХА́СІ (Tallahassee), горад на ПдУ ЗША. Адм. ц. штата Фларыда. 136,6 тыс. ж., з прыгарадамі каля 250 тыс. ж. (1998). Вузел чыгунак і аўтадарог. Гандлёва-фін. цэнтр с.-г. раёна. Прам-сць: паліграф., хім., дрэваапр., тытунёвая. 2 ун-ты.

ТАЛАЧЫ́Н, горад, цэнтр Талачынскага р-на Віцебскай вобл., на р. Друць. За 124 км на ПдЗ ад Віцебска, чыг. ст. на лініі Мінск—Масква, на аўтадарозе Мінск—Масква, вузел аўтадарог на Круглае, Чашнікі, Сянно. 10,6 тыс. ж. (2001).

Упершыню ўпамінаецца ў 1433 як горад у ВКЛ. Уваходзіў у склад *Друцкага княства*. З сярэдзіны 16 ст. гандл. мястэчка Аршанскага пав. Віцебскага ваяв. Належыла роду князёў Друцкіх (Друцкіх-Талачынскіх), з канца 16 ст. Сапегам (імі заснаваны базыльянскія манас-

тыр і царква, 1604), потым Сангушкам. У 1621 у Т. 314 дамоў. У вайну Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—67 спалены, захаваліся 142 дамы. У выніку 1-га падзелу Рэчы Паспалітай (1772) усх. частка мястэчка ўвайшла ў склад Рас. імперыі і стала называцца Стары ці Рускі Т. (да 1793 памежны пункт з мытняй), а заходняя, што знаходзілася за р. Друць — Зарэчны ці Новы Т. Стары Т. — цэнтр Стараталачынскай вол. Копыскага, з 1861 — Аршанскага пав. Новы Т. — цэнтр Зарэчна-Талачынскай вол. Сенненскага пав. Магілёўскай губ. У вайну 1812 Т. разбураны. У 1897 у мястэчку 2614 ж. У пач. 20 ст. ў Т. 3748 ж., 391 дом, у т.л. 6 цагляных пабудоў; працавалі 2 гарбарныя, крухмальны, цагельны, піваварны з-ды, шкляная гута, вадзяны млын, школа, 2 нар. вучылішчы, царква, касцёл. У 1917 у Т. 2181 ж., 355 гаспадарак. З 1920 Т. у складзе Віцебскай губ. РСФСР. З 17.7.1924 цэнтр Талачынскага р-на ў Аршанскай акр. БССР (да 1930), з 1938 у Віцебскай вобл. З 27.9.1938 гар. пасёлак. У 1939 — 6100 ж., ільнозавод (67 рабочых), гарбарны, шпалапільны і інш. з-ды, ткацкая ф-ка. У Вял. Айч. вайну з 8.7.1941 да 26.6.1944 акупіраваны ням. фашыстамі, якія загубілі ў гар. пасёлку і раёне 9521 чал. З 22.7.1955 — горад.

Працуюць крухмальны, масларобчы з-ды, тэкст. ф-ка, элеватар, лясгас. У горадзе *Талачынскі гісторыка-краязнаўчы музей*, Дом культуры, 4 б-кі; царква, касцёл. Брацкая магіла сав. воінаў, партызан. Помнік Вызвалення. Помнікі архітэктуры: Свята-Пакроўская царква (гл. *Талачынская царква*), *Талачынскі манастыр базыльян* (18 ст.). Помнік садова-паркавага мастацтва — парк (19 ст.).

Літ.: Памяць: Гіст.-дак. хроніка Талачынскага р-на. Мн., 1988; Шнейдер А.А. Толочин. Мн., 1983; Друцк старажытны. Мн., 2000; Друцк і Барысаў: Да юбілеяў старажытных гарадоў. Мн., 2002.

Г.І.Дулеба, І.П.Хаўратовіч.



Талачынская царква.

ТАЛАЧЫ́НСКАЯ ЦАРКВА́, помнік архітэктуры віленскага барока ў г. Талачын Віцебскай вобл. Храм *Талачынскага манастыра базыльян*. Засн. ў 1604 Л.Сапегам. З 19 ст. правасл. Пакроўская царква. 3-нефавая базіліка з 2-вежавым гал. фасадам. Прамавугольны цэнтр. неф завершаны на тарцах фігурнымі атыкавымі франтонамі. Адметнасць гал. фасаду надаюць увагнутыя прасценкі і багатая ордэрная пластыка: ступеньчатыя пілястры, раскрапаваныя слаістыя карнізы, складаныя па форме праёмы, нішы, абрамленні і інш. Бакавыя фасады вырашаны плоскасна. Руставаная цокальная ч. і завяршэнні вежаў (верхнія ч. перабудаваны ў 19 ст.) маюць класіцыстычную трактоўку. У інтэр'еры ўнутр. слупы-апоры аформлены спаранымі пілястрамі з антаблементамі. Алтарная ч. адлзелена мураваным іканастасам 18 ст. Антаблементы, падпружныя аркі і арачныя праёмы аздоблены паліхромнай размалёўкай. У 1993 царква адрэстаўрыравана.

Ю.А.Якімовіч.

ТАЛАЧЫ́НСКІ ГІСТО́РЫКА-КРАЯЗНА́ЎЧЫ МУЗЕ́Й. Засн. ў 1985, адкрыты ў 2001 у г. Талачын Віцебскай вобл. Пл. экспазіцыі 152 м², больш за 6,7 тыс. экспанатаў асн. фонду, 5 залаў (2002). Сярод экспанатаў знаходкі з археал. раскопак стараж. Друцка, гарадзішча Кісялі-Дымакуры, курганнага могільніка Дроздава; калекцыі манет Рэчы Паспалітай, Расіі; матэрыялы пра падзеі часоў вайны 1812, 1-й сусв. вайны; абарончыя баі, партыз. рух і вызваленне Талачыншчыны ў Вял. Айч. вайну, пра выдатных землякоў. У экспазіцыі старадрукі «Жыціе святых» (1695), «Трэбнік» (1898) і інш., творы жывапісу, прылады працы і побыту сялян 19 — пач. 20 ст., вырабы мясц. майстроў прыкладнога мастацтва.

І.М.Пікулік.

ТАЛАЧЫ́НСКІ МАНАСТЫ́Р БАЗЫЛЬЯ́Н, помнік архітэктуры позняга барока ў г. Талачын Віцебскай вобл. Засн. ў 1769 магнатамі Сангушкамі. Уключаў жылы корпус, школу (1779), шпіталь. У жылым корпусе размяшчаліся трапезная, келлі манахаў і «цёплая» царква. Будынак 2-павярховы, прамавугольны ў плане, на тарцах — франтоны, завершаны 2-схільным дахам. Фасады расчлянёны пілястрамі, прамавугольныя аконныя праёмы, аформлены плоскімі ліштвамі з валютамі зверху. У комплексе манастыра *Талачынская царква*.

Ю.А.Якімовіч.

ТАЛАЧЫ́НСКІ РАЁН. Размешчаны на ПдУ Віцебскай вобл. Утвораны 17.7.1924 (у сучасных межах з 1931). Пл. 1,5 тыс. км². Нас. 34,1 тыс. чал. (2002), гарадскога 45%. Сярэдняя шчыльн. 23 чал. на 1 км². Цэнтр — г. *Талачын*. Раён уключае г.п. *Коханава*. 271 сельскі нас. пункт, Коханаўскі пасялковы Савет, 10 сельсаветаў: Аболецкі, Азерацкі, Алёнавіцкі, Валосаўскі, Воўкавіцкі, Жукнеўскі, Плоскаўскі, Серкавіцкі, Слаўнаўскі, Талачынскі. На З раёна невял. плошчы забруджаны радыенуклідамі пасля катастрофы на Чарнобыльскай АЭС.

Тэр. раёна знаходзіцца ў межах *Аршанскага ўзвышша*. Паверхня спадзістахвалістая і градава-ўзгорыстая, 70% яе на выш. 200—240 м, ніжэй за 200 м каля 20%. Найвыш. пункт 255 м (каля в. Серкавіца). Глыбіня расчлянення рэльефу да 25—30 м/км². Карысныя выкапні: торф, пясок, пясчана-жвіровы матэрыял, гліны і суглінкі. Сярэдняя т-ра студз. -7,6 °С, ліп. 17,6 °С. Ападкаў 639 мм за год. Вегетац. перыяд 182 сут. Па тэр. раёна праходзіць водападзел паміж рэкамі басейнаў Балтыйскага і Чорнага мораў. Тут бяруць пачатак р. Друць з прытокамі: Бярозаўка, Хвашчоўка з Малінаўкай і Прудчанкай, Крывая з Іржэўкай; Бобр з Асакой; Абчуга; Пліса з Ільянкай; Абалянка; Еленка; на мяжы з Аршанскім р-нам працякае р. Адроў з прытокамі Дзярноўка і Сакалянка. Азёры: Касмачэўскае, Глыбокае, Сярэдняе. Вадасховішчы на рэках Друць, Рагачоўка, Сакалянка, Крывая, Пліса. Пераважаюць глебы с.-г. угоддзяў: дзярнова-падзолістыя забалочаныя (59,8%), дзярнова-падзолістыя (24,7%). Пад лесам 30,2% тэрыторыі. Пераважаюць лясы яловыя, хваёвыя, бярозавыя; трапляюцца асінавыя, чорнаальховыя, шэраальховыя, ясянёвыя, ліпавыя, дубровы; 13% — штучныя насаджэнні, пераважна хваёвыя. Найб. масівы на З і ПдУ раёна. Пад балотамі 2,1% тэр. раёна. Найб. балоты Усвіж-Бук, Слаўнае. У межах раёна мікразаказнікі: бат. Лаўрэнавічы (мядзведжая цыбуля) і ландшафтна-гідралагічны Скарпуцева. Помнікі прыроды мясц. значэння: паркі «Рацава» і «Юзафполле».

Агульная пл. с.-г. угоддзяў 85,4 тыс. га, з іх асушаных каля 20 тыс. га. На 1.1.2002 у раёне 17 калгасаў, 5 саўгасаў, 12 фермерскіх гаспадарак, 6 сялянска-калект. прадпрыемстваў, свінакомплекс «Нарцызава». Сельская гаспадарка спецыялізуецца на малочна-мясной жывё-



Талачынскі манастыр базыльян. Жылы корпус.



лагадоўлі, ільнаводстве, вырошчванні збожжавых і кармавых культур, бульбы. Прадпрыемствы прам-сці: харч. (віно, пладова-ягадныя напіткі, крухмал, макаронныя вырабы, масла, сыр, малочныя прадукты), буд. матэрыялаў (жалезабетонныя і сталярныя вырабы, піламатэрыялы), машынабуд. (экскаватары, машыны для кормавытворчасці), першаснай апрацоўкі лёну (ільнавалакно), паліўнай (торфабрыкеты), тэкстыльнай (баваўняныя тканіны), кааператыўнай (хлебабулачныя, кандытарскія вырабы, безалкагольныя напіткі); лясгас (піламатэрыялы). Па тэр. раёна праходзяць чыгунка і аўтамагістраль Брэст—Масква, аўтадарогі з Талачына ў Сянно і Круглае; газаправоды Ямал (Расія) — Еўропа, Таржок (Расія) — Івацэвічы; прадуктаправод Унеча—Полацк. У раёне 13 сярэдніх, 11 базавых, 8 пачатковых, 2 спарт. школы, 2 школы мастацтваў, ПТВ, Дом дзіцячай і юнацкай творчасці, Дом рамёстваў, спарт.-аздараўленчы лагер, 2 спарт. комплексы, 19 дашкольных устаноў, 36 клубаў, 35 б-к, 6 бальніц, 2 паліклінікі, 5 амбулаторый, 19 фельч.-ак. пунктаў. *Талачынскі гісторыка-краязнаўчы музей.* Выдаецца газ. «Наша Талачыншчына».

Г.С.Смалякоў, А.Г.Шныркевіч.

ТАЛА́Ш Васіль Ісакавіч (25.12.1844, в.Белка Петрыкаўскага р-на Гомельскай вобл. — 23.8.1946), народны герой, удзельнік партыз. руху на Беларусі ў грамадз. 1918—20 і Вял. Айч. войны. У 1919 у час акупацыі польск. войскамі Мазырскага пав., дзе жыў Т., разведчык 417-га палка Чырв. Арміі, арганізаваў і ўзначаліў партыз. атрад (300 чал.), які выбіў ворага з в. Навасёлкі і захапіў вял. трафеі. Узнагароджаны ордэнам Чырв. Сцяга. З 1921 старшыня Навасёлкаўскага с/с. У Вял. Айч. вайну дапамагаў партызанам, за што арыштаваны акупантамі; пасля вызвалення супрацоўнічаў з Мінскім падп. абкомам КП(б)Б. У пач. 1943 з партыз. аэрадрома Зыслаў перапраўлены ў Маскву, дзе выступаў перад рабочымі, воінамі, якія адпраўляліся на фронт. Узнагароджаны ордэнам Айч. вайны 1-й ступені. У г. Петрыкаў яму пастаўлены помнік. Прататып дзеда Т. ў аповесці Я.Коласа «Дрыгва». У в. Навасёлкі *Талаша дзеда дом-музей.*

ТАЛА́ША ДЗЕ́ДА ДОМ-МУЗЕ́Й. Адкрыты ў 1989 у в. Навасёлкі Петрыкаўскага р-на Гомельскай вобл. Размешчаны ў хаце В.І.*Талаша*, пабудаванай ім пасля грамадз. вайны 1918—20. Пл. экспазіцыі 63 м^2, 163 экспанаты асн. фонду (2002). У экспазіцыі матэрыялы пра сям'ю героя, аднавяскоўцаў, фотаздымкі пра жыццё і дзейнасць Талаша, землякоў-партызан, матэрыялы пра дзейнасць 130-й партыз. брыгады, успаміны, лісты з фронту. Адноўлена таксама хата канца 19 ст., дзе жыў Талаш, са стараж. прыладамі працы, рэчамі хатняга ўжытку, хлеў, склеп, студня.

А.А.Мароз.

ТАЛБА́ЧЫК, Талбачыцкі вулканічны масіў, вулканічны масіў на У п-ва Камчатка, у паўд. ч. Ключаўской групы вулканаў, Расія. Складзены з андэзітабазальтаў. З'яўляецца стратавулканам. У складзе Т. — вяршыня Востры Т. (без кратэра, выш. 3682 м), дзеючы вулкан Плоскі Т. (3140 м) і больш за 120 пабочных конусаў. Апошняе моцнае вывяржэнне ў 1975—76.



В.І.**Талаш**.



Ф.І.**Талбухін**.

ТАЛБУ́ЗІН Леў Іванавіч (н. 28.3.1942, станцыя Азінкі Саратаўскай вобл., Расія), бел. дызайнер, медальер. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1970). З 1970 выкладае ў Бел. АМ. Створаныя ім медалі вылучаюцца лаканічнасцю кампазіцыі, тонкасцю мадэліроўкі, гармоніяй ліній і сілуэта: «Сіметрыя» (1974), «І.Мележ», «Музей беларускага народнага мастацтва «Раўбічы» (абодва 1978), «Я.Драздовіч», «М.Багдановіч» (абодва 1981), «Я.Купала» (1982), «М.Гусоўскі» (1983), «А.Адамовіч» (1991), «М.Багушэвіч» (1992), «1000-годдзе хрысціянства на Русі» (2000). Аўтар керамічнага пано «Жнівень» і сааўтар (з Ю.Багушэвічам і Г.Жарыным) афармлення станцыі метро «Плошча Якуба Коласа» Мінскага метрапалітэна (1984), дробнай пластыкі, вобразных інсталяцый. Выканаў скульптурны эталон дзярж. герба «Пагоня» (1991). Распрацаваў серыю апаратаў штучнага кровазвароту «АІК-Мінск 3» (1973), электрашаткаўніцу (1987) і інш., якія ўкаранёны ў вытворчасць.

ТАЛБУ́ХІН Фёдар Іванавіч (16.6.1894, в. Андронікі, цяпер Талбухінскі р-н Яраслаўскай вобл., Расія — 17.10.1949), савецкі военачальнік. Маршал Сав. Саюза (1944). Герой Сав. Саюза (1965). Скончыў школы прапаршчыкаў (1915), штабной службы (1919), курсы ўдасканалення (1930) і Ваен. акадэмію імя Фрунзе (1934). У арміі з 1914, у Чырв. Арміі з 1918. Удзельнік 1-й сусв. вайны. У грамадз. вайну на Зах. фронце, у штабе дывізіі, арміі. З 1938 нач. штаба Закаўказскай ваен. акругі. У Вял. Айч. вайну нач. штаба Закаўказскага, Каўк. і Крымскага франтоў, у маі—ліп. 1942 нам. каманд. войскамі Сталінградскай ваен. акругі. З ліп. 1942 каманд. войскамі 57-й і 68-й армій. З сак. 1943 камандаваў войскамі Паўд., з кастр. 1943 — 4-га Укр., з мая 1944 — 3-га Укр. франтоў. Войскі на чале з Т. удзельнічалі ў *Сталінградскай бітве 1942—43*, вызваленні Украіны і Крыма, у *Яска-Кішынёўскай аперацыі 1944*, вызваленні Румыніі, Балгарыі, Югаславіі, Венгрыі і Аўстрыі. З ліп. 1945 галоўнакамандуючы Паўд. групай войск, адначасова Старшыня саюзнай кантрольнай камісіі ў Румыніі і Балгарыі. Са студз. 1947 камандуючы войскамі Закаўказскай ваен. акругі. Узнагарожаны ордэнам «Перамога».



Л.**Талбузін**. Медалі.

ТАЛДЫ-КУРГА́Н, горад на У Казахстана, цэнтр Талды-Курганскай вобл. На р. Каратал, у перадгор'ях Джунгарскага Алатау. Засн. ў 2-й пал. 19 ст., да 1920 сяло Гаўрылаўка, з 1944 горад. Каля 150 тыс. ж. (2001). Чыг. ст., вузел аўтадарог. Прам-сць: маш.-буд., швейная, абутковая, мэблевая, буд. матэрыялаў. Гіст.-краязнаўчы музей. Тэатр.

ТАЛЕ́ДА (Taledo), горад у цэнтр. ч. Іспаніі, у Новай Кастыліі, на р. Таха. Адм. ц. аўтаномнай вобл. Кастылія-Ламанча і прав. Таледа. Каля 70 тыс. ж. (2001). Чыг. ст., вузел аўтадарог. Стараж. рамесніцкі цэнтр (вытв-сць металавырабаў, у т.л. атрыбутаў карыды — клінкі, бандэрылы і інш.; керамічных, шаўковых, шарсцяных вырабаў). Турызм.

У старажытнасці паселішча іберыйскага племя карпетанаў. У 192 да н.э. заваяваны рымлянамі. Пры вестготах стаў сталіцай (з 567) іх дзяржавы і гал. рэліг. цэнтрам (сіноды 400, 589 і інш.). У 713 заваяваны арабамі (наз. Тулайтула), быў важным гасп., паліт. (з 1031 сталіца эмірата) і культ. цэнтрам. Адваяваны ў 1085 Альфонсам VI Храбрым (гл. ў арт. *Альфонсы*). З 1087 сталіца *Кастыліі* і гал. паліт. (картэсы 1480, 1502, 1538), гасп. (выраб шоўку, сукна, зброі, керамікі; у 1-й пал. 16 ст. — 50 тыс. рамеснікаў), гандл. і культ. цэнтр. У 1520—21 Т.— гал. цэнтр паўстання *камунерас*. Пасля пераносу сталіцы ў 1561 у Мадрыд страціў былое значэнне. У час грамадз. вайны 1936—39 цэнтр франкістаў.

Горад захаваў сярэдневяковую планіроўку. Захаваліся рэшткі рым. цырка, акведука, умацаванняў і мастоў 13—15 ст. Сярод помнікаў маўрытанскай архітэктуры: вароты Пуэрта Бісагра Антыгуа (9 ст.) і Пуэрта дэль Соль (12 ст.; абодва перабудаваны ў 14 ст.); касцёлы Санта-Крыста дэ ла Лус (б. мячэць Баб Мардум, 960), Санта-Марыя ла Бланка (б. сінагога, 1180—13 ст.), Санта-Томе (14 ст.), Санта-Дамінга эль Антыгуа (позні рэнесанс, у інтэр'еры абодвух жывапіс *Эль Грэка*), гатычны сабор (1226—1493, арх. А. і Э. дэ Эгас і інш.; шматлікія капэлы, вітражы, разныя лавы, рэтабла 14—16 ст.), замак Алькасар (13—18 ст.). Горад абвешчаны нац. запаведнікам старадаўняга дойлідства, гіст. цэнтр уключаны ЮНЕСКА ў спіс *Сусветнай спадчыны*. Музеі: Дом-музей Эль Грэка, археал. правінц., Лерма (маст. збор).

Літ.: Малицкая К.М. Толедо — старая столица Испании. М., 1968.

ТАЛЕЙРА́Н, Талейран-Перыгор (Talleyrand-Périgord) Шарль Марыс (13.2.1754, Парыж — 17.5.1838), французскі дзярж. дзеяч, дыпламат. Князь Беневенцкі (1806—15), герцаг Дзіно (з 1817). У 1775—91 генеральны вікарый, біскуп. У 1789 выбраны ад духавенства ў Ген. штаты; далучыўся да трэцяга саслоўя. Ініцыятар дэкрэта аб перадачы царк. зямель у распараджэнне нацыі. Пасля звяржэння манархіі (1792) у эміграцыі (да 1796). У 1797—1807 міністр замежных спраў Францыі. У 1808 уступіў у тайныя зносіны з рас. імператарам *Аляксандрам I*, пазней з аўстр. міністрам замежных спраў К.В. фон *Метэрніхам*. У 1814—15 у перыяд 1-й рэстаўрацыі Бурбонаў кіраўнік урада і міністр замежных спраў. На *Венскім кангрэсе 1814—15* узначальваў франц. дэлегацыю. Выкарыстаўшы супярэчнасці паміж краінамі-пераможцамі, дамогся расколу антыфранц. кааліцыі еўрап. дзяржаў і прыняцця выгадных для Францыі рашэнняў. У 1830—34 пасол у Лондане.

Літ.: Тарле Е.В. Талейран. М., 1962; Борисов Ю.В. Шарль Морис Талейран. 2 изд. М., 1989.



Панарама **Таледа**.

ТА́ЛЕНТ (ад грэч. talanton вага), высокая ступень прыроднай *адоранасці* і развіцця *здольнасцей* да пэўнага віду дзейнасці. Фарміруецца з ранняга дзяцінства як выяўленне задаткаў і схільнасцей да пэўнага віду дзейнасці. Станаўленню Т. садзейнічаюць своечасовае дыягнаставанне здольнасцей і сістэматычная работа над іх развіццём. Т. можа выяўляцца ва ўсіх сферах жыцця (навук., паліт., маст. і інш.) і характарызуецца прынцыповай навізной, высокай дасканаласцю вынікаў творчай дзейнасці.



Ш.М.**Талейран**. Мастак Ф.Жэрар.



Талер Рэчы Паспалітай. 1580.

ТА́ЛЕР (ням. Taler), буйная сярэбраная высокай пробы манета еўрап. краін 16—19 ст., грашова-лікавая адзінка, вагавая адзінка для серабра. З'яўленне Т. выклікала пераход ад грашова-лікавага перыяду *гроша* да талернага ў гаспадарцы еўрап. краін. Першыя Т. адпавядалі залатому *дукату* (да 1559), выбіты ў 1484 у Ціролі, у 1500 у Саксоніі. У 16—17 ст. Т. меў нефіксаваны курс. Манета Прусіі 1765—90, намінал мясц. эмісій папяровых бонаў Прусіі 19 ст. Гандлёвы Т. біўся для арабскіх княстваў, Ёменa, Франц. берага Самалі, Эфіопіі і інш. тэрыторый у 20 ст. шэрагам еўрап. краін па стапе 18 ст. У 18—19 ст. манеты талернага тыпу атрымліваюць нац. назвы (напр., долар) і асобныя стандарты ўтрымання серабра. У бел. пісьмовых крыніцах 2-й пал. 16 — 1-й пал. 18 ст. тэрмін Т. (таксама таляр, тарэль) сустракаецца з удакладненнем: біты, імперыяльны, новы, стары, тварды, цалкоўны. Асн. грашовая адзінка і адзін з наміналаў банкнотаў Варшаўскага княства 1810. *І.І.Сінчук.*

ТАЛЕРА́НТНАСЦЬ (ад лац. tolerantia цярпенне), цярпімасць асобнага індывіда або супольнасці людзей да прадстаўнікоў інш. канфесій, паліт. партый, грамадскіх арганізацый, а таксама да іншадумства, чужых поглядаў, вераванняў і паводзін. Звычайна складваецца на працягу многіх гадоў у працэсе *сацыялізацыі* асобы пад уплывам сац. фактараў, грамадска-паліт. працэсаў, асаблівасцей этнакульт. развіцця, канфесіянальнай сітуацыі і г.д. Вызначаецца здольнасцю адначасова адзначаць станоўчыя і адмоўныя бакі псіхалогіі, паводзін чалавека ці груп людзей. Т. — важная прыкмета агульнай і паліт. культуры, неабходны элемент грамадз. супольнасці і прававой дзяржавы, дэмакратыі і гуманізму, ідэалагічнага і паліт. *плюралізму*. Яе разглядаюць як неабходную ўмову

паспяховага вырашэння разнастайных асабістых і грамадскіх праблем шляхам узаемнага ўліку інтарэсаў, пошуку згоды і магчымых кампрамісаў. Праявы неталерантных адносін найчасцей выкліканы неспрыяльнымі сац.-эканам., грамадска-паліт. абставінамі, пагаршэннем умоў для ўсебаковага развіцця нац. культур і моў. Тыповы прыклад недастатковай Т. — непрыняцце пэўных ідэй, меркаванняў толькі таму, што яны выказаны непрафесіяналамі. У палітыцы Т. азначае цярпімае стаўленне да апазіцыі. Для *ментальнасці* і *нацыянальнага характару* беларусаў характэрны этнакульт. і рэліг. Т., аб чым сведчаць адсутнасць на бел. землях вострых, крывавых канфліктаў на этн. і канфесіянальнай глебе, працяглае мірнае суіснаванне нац. супольнасцей, канфесій, плённае ўзаемадзеянне розных нар. традыцый, звычаяў, абрадаў і інш.

Э.С.Дубянецкі.

ТАЛЕРА́НТНАСЦЬ ІМУНАЛАГІ́ЧНАЯ, аслабленне або страта здольнасці арганізма да імуннага адказу на канкрэтны *антыген* (у выніку яго папярэдняга ўвядзення). Выяўлена ў пазваночных жывёл і чалавека. Месца фарміравання Т.і. — цэнтр. (тымус, касцявы мозг) і перыферычныя (селязёнка, лімфатычныя вузлы) лімфоідныя органы. Адрозніваюць натуральную Т.і. (напр., да аўтаантыгенаў — асабістых антыгенаў арганізма) і штучную (напр., індуцыраваную мікробнымі антыгенамі). Бывае прыроджаная і набытая. Страта Т.і. да аўтаімунагенаў прыводзіць да развіцця *аўтаімунных хвароб.*

І.М.Семяненя.

ТАЛЕ́РКІ, самагучальны ударны музычны інструмент. Складаецца з 2 метал. дыскаў (з чашападобнымі ўзвышэннямі ў цэнтры), якімі ўдараюць адзін аб адзін і глушаць, прыціскаючы да грудзей. Па памерах і характары гучання бываюць малыя (дыяметр 25—35 см), сярэднія (37,5 — 45 см), вял. (47,5 — 60 см); «турэцкія» (яркага гучання), «кітайскія» (з прыгукам гонга), педальныя («чарльстон», ці джазавыя), «антычныя» («кроталы» — самыя малыя па памерах) і інш. Ужываюць і 1 Т., падвешаную на руцэ або штатыве, па якой б'юць палкай ад літаўр і інш. Вядомы са стараж. часоў. У сімф. аркестр уведзены ў канцы 18 ст. Выкарыстоўваюцца ў бел. нар. інстр. музыцы (вядомы з 17—18 ст. ў складзе «яныčарскіх капэл»). Спалучэнні Т. і барабана, Т. як састаўной часткі і нар. ударнай установкі з педаллю (у якой, акрамя барабана, шумёлы, бубен, клякотка і інш.) складаюць характэрныя рысы бел. нар. інстр. музыкі з адметнымі мясц. традыцыямі.

А.В.Скорабагатчанка.

ТАЛІ́БЫ (араб—таліб, студэнт, вучань), члены ультракансерватыўнага радыкальнага ісламскага руху «Талібан» у Афганістане, створанага ў 1994 на тэр. Пакістана выпускнікамі рэліг. мусульм. вучылішчаў. Абвясцілі сваёй мэтай стварэнне «сапраўднай ісламскай» дзяржавы і барацьбу супраць урада Б.*Рабані* і ўсіх груповак *муджахідаў*, якія змагаліся за ўладу пасля вываду з Афганістана сав. войск у 1989. Гэтыя лозунгі забяспечылі Т. шырокую падтрымку насельніцтва, калі ў кастр. 1994 года іх атрады ўвайшлі на тэр. Афганістана. Неўзабаве Т. захапілі г. Кандагар, які стаў месцам знаходжання іх кіраўніцтва, у 1995 — г. Герат, а ў вер. 1996 — Кабул. У 1997 «Талібан» абвясціў стварэнне «Ісламскага эмірата Афганістан» на чале з мулой Мухамедам Амарам, які атрымаў тытул «уладара прававерных». Да канца 1990-х г. Т. кантралявалі б.ч. тэр. Афганістана, на якой былі ўведзены законы *шарыяту* ў надзвычай жорсткай інтэрпрэтацыі (забарона кіно і тэлебачання, адмова жанчынам у праве на адукацыю і працу і г.д.). Абапіраліся пераважна на пуштунаў у процівагу «паўночнаму альянсу» з таджыкаў, узбекаў і хазарэйцаў на чале з Рабані. Апафеозам палітыкі ліквідацыі ўсяго «неісламскага» стала знішчэнне Т. статуй Буды ў прав. Баміян, якія ўключаны ЮНЕСКА у спіс *Сусветнай спадчыны*. Гэта прывяло да амаль поўнай ізаляцыі рэжыма «Талібан» на міжнар. арэне. На тэр., якую кантралявалі Т., знайшлі прытулак кіраўнікі арг-цый, што абвінавачваліся ЗША у дачыненні да тэрактаў у Нью-Йорку 11.9.2001, таму ЗША з войскамі «паўночнага альянсу» восенню 2001 пачалі ваен. аперацыю супраць Т., якая прывяла да звяржэння іх улады.

Літ.: Марсден П. Талибан: Война и религия в Афганистане: Пер. с англ. М., 2002.

У.С.Кошалеў.



Талеркі.

ТАЛІ́ДА (Toledo), горад на ПнУ ЗША, у штаце Агайо. Засн. ў 1837. 312,2 тыс. ж., з прыгарадамі каля 650 тыс. ж. (1998). Вузел чыгунак і аўтадарог, буйны порт на воз. Эры. Аэрапорт. Прам-сць: чорная і каляровая металургія, аўтамаб. (выт-сць вузлоў і дэталей для аўтамабіляў, аўтамашын павышанай праходнасці), агульнае машынабудаванне, суднабудаванне, металаапрацоўка, шкляная (буйнейшыя ў краіне прадпрыемствы), нафтаперапр., хім., харчовая. Ун-т.

ТАЛІЁН (ад лац. talio адплата, адпаведная злачынству), прынцып пакарання, які склаўся ў стараж. грамадстве і быў успрыняты феад. правам. Заключаўся ў прызначэнні пакарання вінаватаму ў строгай адпаведнасці з нанесенай ім шкодай («вока за вока», «зуб за зуб»). Знайшоў адлюстраванне ў кодэксе *Хамурапі*, стараж.-яўр. праве, рымскіх Законах XII табліц і часткова ў *Статуце Вялікага княства Літоўскага 1588*, які прадугледжваў членашкодніцкія пакаранні.

ТА́ЛІЙ (лац. Thallium), Tl, хімічны элемент III групы перыяд. сістэмы, ат. н. 81, ат. м. 204,383. Прыродны Т. — сумесь стабільных ^{203}Tl (29,5%) і ^{205}Tl (70,5%). *Рассеяны элемент*, у зямной кары $3 \cdot 10^{-4}$% па масе. Адкрыты ў 1861 спектральным метадам англ. вучоным У.Круксам і незалежна ад яго франц. хімікам К.А.Лямі, які атрымаў метал. Т.; названы па колеры (ярка-зялёны) характэрнай спектральнай лініі (ад грэч. thallos — маладая, зялёная галінка).

Мяккі серабрыста-шэры метал, $t_{пл}$ 303 °С, $t_{кіп}$ 1475 °С, шчыльн. 11849 кг/м^3. У злучэннях мае ступень акіслення +1 (злучэнні аднавалентнага Т.) і +3. Найб. устойлівыя злучэнні Tl(I); многімі хім. ўласцівасцямі Т. падобны на шчолачныя металы. У паветры хутка акісляецца і пакрываецца цёмнай плёнкай геміаксіду Tl_2O. У прысутнасці кіслароду ўзаемадзейнічае з вадой з утварэннем гідраксіду TlOH (добра растворацца ў вадзе, шчолач). Захоўваюць пад слоем гатаванай дыстыляванай вады або парафіну. Растворацца ў азотнай і сернай к-тах. Пры пакаёвай т-ры ўзаемадзейнічае з галагенамі, пры нагрванні — з халькагенамі і фосфарам. Атрымліваюць з адходаў і паўпрадуктаў кадміевай вытв-сці, пылу свінцова-медзеплавільных з-даў. Выкарыстоўваюць як кампанент падшыпнікавых і кіслотатрывалых сплаваў на аснове свінцу і волава, амальгаму Т. (вадкасць з т-рай застывання -59 °С) для нізкатэмпературных тэрмометраў, штучны радыенуклід ^{204}Tl (перыяд паўраспаду 3,56 года) у якасці крыніцы β-выпрамянення, галагеніды (хларыд TlCl, брамід TlBr) і іх цвёрдыя растворы для вырабу лінзаў і інш. дэталей прыбораў інфрачырв. тэхнікі. Т. і яго злучэнні высокатаксічныя: пашкоджваюць нерв. сістэму, ныркі, страўнік, выклікаюць выпадзенне валасоў, ГДК для Т. ў вадзе 0,1 мг/л.

ТА́ЛІН (Tallinn) горад, сталіца Эстоніі, на Пн краіны. 435 тыс. ж. (1999). Порт у Фінскім зал. Балтыйскага м., вузел чыгунак і аўтадарог. Міжнар. аэрапорт. Гал. прамысл. і культ. цэнтр краіны. Прам-сць: маш.-буд. і металаапр., у т.л. эл.-тэхн. і радыёэлектронная, суднарамонт і суднабудаванне; лёгкая, хім., хі-



Талін. Вежа «Пакс Маргарэтэ» («Тоўстая Маргарыта»).

міка-фармацэўтычная, харч., дрэваапр., цэлюлозна-папяровая, паліграф., вытв-сць ювелірных вырабаў. АН Эстоніі, ун-т, тэатры.

У 10—11 ст. на месцы Т. было паселішча стараж. эстаў Ліданісе. Упершыню пад назваю Калывань упамінаецца ў 1154 араб. географам Ідрысі і ў рус. летапісах. У 1219 захоплены Даніяй, названы Рэвель (афіц. назва Т. да 1917). У 1230 ў Т. ўведзена любекскае гар. права. З 1285 чл. *Ганзы*. У 1346—1561 уладанне Тэўтонскага, потым — Лівонскага ордэнаў. Гандляваў з Ноўгарадам, Псковам, Гданьскам, Любекам, Антверпенам і інш. У 1524 у Т. праведзена *Рэфармацыя*. У 1561—1710 пад уладай Швецыі. У 1569 горад бамбардзіраваны любекска-дацкім флотам. У 1570—71 і 1577 рус. войскі беспаспяхова імкнуліся захапіць Т. у ходзе *Лівонскай вайны 1558—83*. У 1591—92 б.ч. насельніцтва памерла ад чумы і голаду (1602). У 1634 пачалася мануфактурная вытворчасць. У Паўн. вайну 1700—21 адышоў да Расіі (1710), цэнтр Эстляндскай губ., пабудавана ваен. гавань. У 1790 каля Т. адмірал П.В.Чычагоў адбіў атаку швед. флоту. Пасля злучэння чыгункай з С.-Пецярбургам (1870) Т. — важны партовы горад і прамысл. цэнтр. У 1918—40 і з 1991 сталіца Эстоніі; у 1940—91 — Эст. ССР. У 2-ю сусв. вайну акупіраваны ням. фашыстамі (1941—44).

Цэнтр. месца ў планіровачнай структуры Т. захоўвае (з невял. зменамі) Стары горад, які гістарычна падзяляецца на Вышгарад і Ніжні горад. На Вышгарадзе знаходзяцца Вышгародскі замак (закладзены ў 13 ст., неаднаразова перабудоўваўся, зах. і паўн. сцены з 3 вугламі вежамі 13—14 ст.), Домскі сабор (13—15 ст., готыка; прытвор і капэла 15—17 ст.; вежа 1779, арх. К.Л.Гейст, барока; надмагілле 16—19 ст., у т.л. работы А.*Пасера*; вісячая кафедра 1686, скульпт. Х.Акерман), б. палац губернатара (1767—73, арх. І.Шульц, пераход ад барока да класіцызму), ансамбль будынкаў б. губ. суда (1784—92, арх. І.Маор, класіцызм). У Ніжнім горадзе захаваліся фрагменты крапасных сцен з 27 вежамі, у т.л. вежы «Пакс Маргарэтэ» («Тоўстая Маргарыта»; 1529, майстар Г.Конінгк), «Кік-ін-дэ-Кёк») («Глядзі ў кухню»; 15—17 ст.); ансамбль Ратушнай плошчы з ратушай (1402—04; вежа з флюгерам «Стары Томас», 1530), аптэкай 15—17 ст.; гатычныя храмы Нігулістэ (13—15 ст.), Пюхавайму (Св. Духа; 13—14 ст., разны алтар 1483, аўтар Б.Нотке), Олевістэ (14—15 ст., шпіль выш. 123,7 м, самы высокі ў Прыбалтыцы), будынкі Вял. гільдыі (цяпер гіст. музей; 1407—10), брацтва Чорнагаловых (1597, арх. Пасер, рэнесанс). У межах горада руіны 3-нефавай царквы манастыра св. Брыгіты (1407—36), палацава-паркавы ансамбль Кадрыёрг (цяпер маст. музей; 1718—25, арх.



Талін. Фрагмент крапасной сцяны.



Талін. Від Старога горада.



Панарама **Таліна**.



Талін. Пеўчае поле.

Н.Мікеці, М.Зямцоў, барока). У 19 ст. сярэдневяковыя будынкі набылі «ўзорныя» фасады ў духу класіцызму. Жылыя раёны Т. забудоўваліся пераважна 1—2 павярховымі дамамі, будынкамі ў духу эклектыкі і мадэрна (адм. будынак на Пярнускай шашы, 1912, арх. Э.Саарынен; т-р «Эстонія», 1913, арх. А.Ліндгрэн, перабудаваны). Будынкі 1930-х г. з рысамі функцыяналізму (Дом мастака, арх. Э.Куузік, А.Соанс). У Вял. Айч. вайну многія збудаванні зруйнаваны. У пасляваен. гады горад адноўлены, пабудаваны жылыя раёны (Мустамяэ, Ласнамяэ і інш.). Сярод пабудоў 2-й пал. 20 ст.: ансамбль Пеўчага поля з эстрадай (1960, арх. А.Котлі, Х.Сепман і інш., інж. Э.Паальман), Політэхн. ін-т (1962—69, арх. У.Тэльпус і інш.), гасцініцы «Віру» (1972, арх. М.Порт, Сепман, В.Там і інш.) і «Алімпія» (1980, арх. Т.Каллас, Р.Керэтэн і інш.), Алімп. цэнтр ветразевага спорту ў Пірыце (арх. Х.Лоавеэр, Сепман, П.Янес і інш.), Палац культуры і спорту (абодва 1980, арх. Р.Карп, Р.Алтмяэ). У Т. парк-музей (сканcэн) нар. дойлідства і побыту «Рок аль Марэ» (з 1957); 16 музеяў, у т.л. маст., гіст., марскі, прыроды; т-ры *Нацыянальная опера «Эстонія»* і Нац. балет, эстр., драм., рус. драм., юнага гледача, лялек. Гіст. цэнтр Т. ўключаны ЮНЕСКА у спіс *Сусветнай спадчыны*.

Беларусы ў Таліне. Пасля 1-й сусв. вайны ў горадзе дзейнічалі рэгістрацыйна-пашпартныя аддзелы пры *Вайскова-дыпламатычнай місіі БНР* у Латвіі і Эстоніі (снеж. 1919— жн. 1920). У выніку распаду СССР і абвяшчэння незалежнасці Эстоніі і Беларусі ў Т. актывізавалася нац.-культ. дзейнасць мясц. беларусаў. З 1993 выдаецца бел. гіст. часопіс «Грунвальд». У 1994 засн. Беларускі культ. цэнтр «Бацькаўшчына». У Т. жыве каля палавіны бел. дыяспары ў Эстоніі (прыбл. 10 тыс. чал).

Літ.: Брунс Д., Кангропооль Р. Таллин. 2 изд. Л., 1980; Розенберг И. Музеи Таллина. Таллин, 1983.

ТАЛІСМА́Н (франц. talisman ад познегрэч. telesma літар. — рэлігійны абрад, прысвечаны прадмет), рэч, якая, паводле ўяўленняў прымхлівых людзей, прыносіць яе ўладальніку шчасце, поспех, аберагае ад няўдач. Т., які насілі на целе, наз. *амулетам*. Вера ў Т. узнікла ў першабытнага чалавека, які імкнуўся ўплываць на сілы прыроды, не ведаючы яе законаў.

ТА́ЛІЦА, рака ў Старадарожскім, Слуцкім і Любанскім р-нах Мінскай вобл., правы прыток р. Арэса (бас. р. Прыпяць). Даўж. 40 км. Пл. вадазбору 455 км^2. Пачынаецца каля в. Мядзведня Старадарожскага р-на, упадае ў р. Арэса на Пд ад сажалак рыбгаса «Любань», каля г. Любань. Рэчышча каналізаванае.

ТА́ЛІЯ, Фалія, у старажытнагрэчаскай міфалогіі: 1) адна з 9 *муз*, апякунка камедыі. Лічылася дачкой *Зеўса* і *Мнемасіны*. Стараж. грэкі ўяўлялі яе прыгожай жанчынай з камічнай маскай у руцэ і вянком з плюшчу на галаве. 2) Адна з *харыт*. 3) Адна з *нерэід*. *А.Г.Зельскі.*

ТАЛКАЧО́ВА Галіна Сямёнаўна (н. 3.3.1934, Мінск), бел. актрыса. Нар. арт. Беларусі (1990). Скончыла Бел. тэатр.-маст. ін-т (1957, курс К.*Саннікава*). Працуе ў Нац. акад. т-ры імя Я.Купалы. Выканаўца характарных роляў. Творчасць Т. адметная паглыбленым псіхалагізмам, дэталёвай распрацоўкай знешняга малюнка ролі, яркай тэатр. формай. Ролі ў бел. рэпертуары: Інга, Лена («Выклік багам», «Начное дзяжурства» А.Дзялендзіка), Зося («Сэрца на далоні» паводле І.Шамякіна), Маці («Зацюканы апостал» А.Макаёнка). Шэраг яркіх вобразаў стварыла ў сучасным рэпертуары: Кэт («Чацвёрты» К.Сіманава), Наташа («Яшчэ раз пра каханне» Э.Радзінскага), Ніна («Гросмайстарскі бал» паводле І.Штэмлера),







Г.С.**Талкачова**.

М.Ф.**Талкачоў**.

С.Л.**Талкачоў**.

Ліза Хрэнава («Традыцыйны збор» В.Розава), Марыя («Святая святых» І.Друцэ). Сярод інш. роляў: Ірына, Гурмыжская («Апошняя ахвяра», «Лес» А.Астроўскага), Насця («На дне» М.Горкага), Ганна Андрэеўна («Рэвізор» М.Гогаля), Амелія («Смерць ваяводы» Ю.Славацкага), Дзяўчына, Зехра («Забыты ўсімі», «Дзівак» Назыма Хікмета), Голда («Памінальная малітва» Р.Горына), Мелі («Ліса і вінаград» Г.Фігейрэду), Жанчына («Тая, якая сама па сабе блукае» паводле Р.Кіплінга), Элеанора («Месье Амількар, альбо Чалавек, які плаціць» І.Жаміяка), Эліда («Жанчына з мора» Г.Ібсена), Івона («Жудасныя бацькі» Ж.Както), Яна («Апошні закаханы» Н.Саймана).

Літ.: Чаркас І. Каб сказаць сваё, запаветнае // Тэатр. Мінск. 1984. № 1.

Г.Г.Бордусава.



Г.Талкачова ў ролі Голды.

ТАЛКАЧО́ВА Ларыса Сямёнаўна (н. 1.2.1939, г. Самара, Расія), бел. піяністка, канцэртмайстар. Дачка С.Л.*Талкачова*. Засл. арт. Беларусі (1990). Скончыла Бел. кансерваторыю (1961, кл. Р.Шаршэўскага, Э.Тырманд). З 1961 канцэртмайстар Нац. акад. т-ра оперы Беларусі. Удзельнічала ў падрыхтоўцы опер В.А.Моцарта («Дон Жуан», «Вяселле Фігара», «Чароўная флейта»), Дж.Расіні («Севільскі цырульнік», «Шлюбны вэксаль»), Дж.Пучыні («Тоска», «Багема»), П.Чайкоўскага («Пікавая дама»), С.Танеева («Арэстэя») і інш.; вяла канцэртную дзейнасць з вядучымі салістамі т-ра. *Л.А.Шымановіч.*

ТАЛКАЧО́Ў Міхаіл Фёдаравіч (30.6.1922, в. Дуброўка Добрушскага р-на Гомельскай вобл. — 10.11.1998). Герой Сав. Саюза (1945). Скончыў Пензенскае артыл. вучылішча (1942), Ленінградскую вышэйшую афіцэрскую школу артылерыі (1948). У Вял. Айч. вайну са жн. 1941 на Паўн., Паўн.-Зах., 2-м Прыбалт., 1-м Бел. франтах. Удзельнік баёў у Цвярской вобл., на тэр. Літвы, Польшчы, Германіі. Батарэя асобнага знішчальна-процітанк. дывізіёна на чале з Т. вызначылася 22.4.1945 у баях на подступах да Берліна: падраздзяленне прасунулася ў тыл ворага, перарэзала шашу, не дазволіла рэзервам праціўніка прарвацца да Берліна (знішчыла шмат гітлераўцаў, баявой тэхнікі, у т.л. 3 дальнабойныя гарматы). Удзельнік штурму рэйхстага, *Парада Перамогі* ў Маскве. Да 1972 у Сав. Арміі.

ТАЛКАЧО́Ў Сямён Львовіч (29.5.1907, г. Бабруйск Магілёўскай вобл. — 7.8.1970), бел. піяніст. Нар. арт. Беларусі (1964). Скончыў Маскоўскую кансерваторыю (1930). З 1931 працаваў у Ленінградзе, Іркуцку, Куйбышаве. З 1938 канцэртмайстар, з 1943 гал. канцэртмайстар Дзярж. т-ра оперы і балета Беларусі. Свабодная арыенціроўка ў партытуры, дасканалае валоданне фп. і веданне прыроды чалавечага голасу павышалі муз. ўзровень спектакляў, падрыхтаваных з яго ўдзелам. *І.Г.Нісневіч.*

ТАЛКАЧО́Ў Яўген Аркадзевіч (н. 5.8.1945, г. Мазыр Гомельскай вобл.), бел. фізік-тэарэтык. Д-р фіз.-матэм. н. (1990), праф. (2000). Скончыў Маскоўскі ун-т (1969). З 1974 у Ін-це фізікі Нац. АН Беларусі. Навук. працы па

квантавай тэорыі, гісторыі і метадалогіі навукі, праблемах выкладання фізікі. Высветліў ролю тапалагічных эфектаў у дынаміцы класічных і квантавых сістэм на аснове алг. і геам. метадаў. Даследаваў заканамернасці працэсу ўспрымання новых ведаў рознымі сац. аб'ектамі і механізм пранікнення фіз. ведаў у агульнаадук. сферу на розных яе ўзроўнях. Адзін з аўтараў эксперым. навуч. камплекта для сярэдняй школы і агульнаадук. стандарта па фізіцы.

Тв.: Кватернионы в релятивистской физике. Мн., 1989 (разам з А.В.Бярэзіным, Ю.А.Курачкіным); Формирование адекватного образа науки как необходимый элемент гуманитарного образования. Мн., 1996 (разам з В.І. Дыніч, Л.М. Тамільчыкам). *А.І.Болсун.*

ТАЛКУНО́ВА Валянціна Васілеўна (н. 12.7.1946, г. Армавір Краснадарскага краю, Расія), расійская эстрадная спявачка. Нар. арт. Расіі (1987). З 1966 на сцэне. З 1973 салістка Масканцэрта. З 1987 маст. кіраўнік створанага ёю Маскоўскага т-ра муз. драмы і песні. Першая выканаўца прысвечаных ёй песень і вак. цыклаў, манаоперы «Рускія жанчыны» І.Катаева на вершы М.Някрасава. У рэпертуары таксама рус. нар. песні. 1-я прэмія на Усесаюзным тэлеконкурсе «З песняй па жыцці» (1973).

Л.А.Шымановіч.

ТАЛМУ́Д (стараж.-яўр., літар. — вывучэнне), збор дагматычных рэлігійна-этычных і прававых палажэнняў *іудаізму*, складзены ў 4 ст. да н.э. — 5 ст. н.э. Пачатак яго стварэнню паклалі іудзейскія законавучыцелі (танаі), якія займаліся тлумачэннем *Пяцікніжжа*. Іх вусныя і пісьмовыя тлумачэнні *Торы* атрымалі назву Мішна (паўтор, другі закон). Збор тлумачэнняў Мішны пад назвай Гемара (дапаўненне) разам з самой Мішнай склалі Т. Тлумачэнні Мішны зроблены ў Палесціне і ў Вавілоніі, таму адрозніваюць 2 варыянты Т. — палесцінскі, або іерусалімскі, і вавілонскі. У Т. разам з рэліг. і грамадзянскім законамі змешчаны міфы, легенды, фальклор, а таксама звесткі па матэматыцы, геаграфіі, прыродазнаўстве, медыцыне, гісторыі і інш. навуках. Першае поўнае выданне Т. — Т. вавілонскі надрукаваны ў 1520—23 у Венецыі ў друкарні Д.Бомберга. На Беларусі Т. вядомы з канца 14 ст., калі тут заснаваны першыя яўр. абшчыны.

ТАЛО́М, вегетатыўнае цела ніжэйшых раслін, тое, што *слаявіна*.

ТАЛО́ЧКА Мікалай Канстанцінавіч (н. 1.1.1951, ст. Баравуха 1-я Полацкага р-на Віцебскай вобл.), бел. вучоны ў галіне тэхн. фізікі. Д-р фіз.-матэм. н. (1992), праф. (2000). Скончыў Мінскі радыётэхн. ін-т (1973). З 1976 у Ін-це тэхн. акустыкі Нац. АН Беларусі (з 1991 заг. лабараторыі, з 1999 нам., з 2002 в.а. дырэктара). Адначасова ў 1996—2000 у Віцебскім тэхнал. ун-це. Навук. працы па фізіцы і тэхналогіі працэсаў крышталізацыі і спякання, лазернай апрацоўцы матэрыялаў. Распрацаваў метады вырошчвання нелінейных аптычных крышталёў, фіз. асновы селектыўнага лазернага спякання парашкоў, тэарэт. абгрунтаваў кластэрны механізм зародкаўтварэння і росту крышталёў.

Тв.: Методы выращивания кристаллов из растворов. Мн., 1991 (разам з У.У.Клубовічам); Вторичное зародышеобразование в растворах. Мн., 1992 (з ім жа).

ТАЛО́ЧКА Уладзіслаў (8.2.1887, г. Гродна — 13.11.1942), бел. рэлігійны і культурна-асветны дзеяч. У 1909—14 вывучаў тэалогію і філасофію ў каталіцкім ін-це ў Інсбруку (Аўстрыя). З 1914 святар у Вільні. Адзін з першых пачаў публічна ўжываць бел. мову ў набажэнствах. У 1915—18 адзін з ініцыятараў і арганізатараў Віленскага к-та дапамогі пацярпелым ад вайны. З 1917 быў звязаны з *Беларускай хрысціянскай дэмакратыяй*, у яе друкаваным органе газ. «Krynica» («Крыніца») змяшчаў артыкулы культ.-адраджэнскай і рэліг. праблематыкі. Удзельнічаў у арганізацыі і правядзенні *Беларускай канферэнцыі 1918* у Вільні. Уваходзіў у склад *Літоўскай Тарыбы*. У міжваен. дваццаціоддзе адзін з вядучых публіцыстаў час. віленскіх краёўцаў «Przegląd Wileński» («Віленскі агляд»). З 1920-х г. праследаваўся польскімі свецкімі і духоўнымі ўладамі. 15.12.1938 як «нядобранадзейная асоба» выселены ў Беласток. На пач. 2-й сусв. вайны вярнуўся ў Вільню.

ТАЛО́ЧКІ, Буйніцкія, княжацкі род у ВКЛ. Паходжанне невядома, магчыма, Т. — адгалінаванне полацкіх *Ізяславічаў*. У канцы 14 ст. князь Юрый Т. атрымаў ад вял. князя ВКЛ Вітаўта Рагачоўскую воласць. У сярэдзіне 15 ст. сын Юрыя князь Фёдар Талочкавіч прадаў вотчынны маёнтак Высокае пану Гаштольду. Пляменнік Фёдара князь Леў меў маёнткі Гатушычы і Буйнічы, ад назвы якога ўтворана прозвішча Буйніцкія. На яго сыне Аляксею (?—1505) род Т. у мужчынскай лініі згас, а родавыя маёнткі перайшлі да шваграў Аляксея — Кандрата Івашкевіча, Аляксандра Солтанавіча і князя Івана Крошынскага.

ТАЛО́ЧНЫЯ ПЕ́СНІ, талаковыя песні, талачанскія песні, разнавіднасць каляндарна-абрадавых песень, што суправаджалі працу земляроба на *талацэ*. У залежнасці ад віду сезонных работ вылучаюцца 3 групы Т.п.: песні веснавой талакі, жніўныя талочныя, песні асенніх талок. Самая шматлікая 1-я група, якая і прадвызначыла прыроду жанру. Яна добра перадае атмасферу працы, характэрны для яе ўздым і радасны настрой. Антытэза, іронія, дасціпны гумар уласцівы Т.п., у якіх адлюстраваны характар працы розных удзельнікаў талакі. У песнях часта гучыць зварот да гаспадара, якому талачане нагадваюць пра работу і разлік за яе; пры гэтым ў незласлівай форме, з жартам дакараюць за нібыта недастатковае частаванне работнікаў, пра заліш-нюю ашчаднасць гаспадыні. У некат. песнях гучалі і заклёны на добры ўраджай, аднак пераважалі бяседныя Т.п. пра каханне, перажыванні маладой замужніцы ў чужой сям'і і г.д. У веснавых Т.п. пераважае вобраз талочніцы — вясёлай і дасціпнай дзяўчыны (жанчыны) — гал. ўдзельніцы талакі. У жніўных Т.п. шырокая карціна жніва, вобразы жней-талачанак, якія «зжалі поле нязмернае», «змялі ніву мяцёлкаю». Яны пераважна бяседнага характару, выконваліся ў час застолля пры калектыўнай апрацоўцы лёну, азімай сяўбе, малацьбе, на дакопках бульбы. Да іх прымыкаюць спарышовыя песні (вобраз спарыша ўвасабляў урадлівасць і дабрабыт). Т.п. былі пашыраны на ўсёй Беларусі, найб. шырока бытавалі на Падзвінні.

Публ.: Восеньскія і талочныя песні. Мн., 1981. *А.С.Ліс.*

ТА́ЛСА (Tulsa), горад на Пд ЗША, штат Аклахома. 381,4 тыс. ж., з прыгарадамі каля 750 тыс. ж. (1998). Вузел чыгунак і аўтадарог, порт на р. Арканзас. Аэрапорт. Гандл.-фін. і арганізац. цэнтр раёна здабычы і перапрацоўкі нафты і газу. Прам-сць: вытв-сць нафтавага абсталявання, дарожна-буд. машын, авіяц. дэталей і вузлоў; эл.-тэхн. і радыёэлектронная, аўтамаб., прыладабуд., чорная металургія, нафтаперапр., хім., сілікатна-керамічная, паліграф., харч., швейная. Ун-т.

ТА́ЛСІНСКАЯ ПРЫГАЖУ́НЯ, латвійскі сорт груш нар. селекцыі. Пашыраны на Беларусі.

Дрэва моцнарослае, крона шырокапірамідальная, густая. Пладаносіць на 7-ы год. Сорт зімаўстойлівы, ураджайны, устойлівы да бактэрыяльных і грыбных хвароб. Плады дробныя (50 г), грушападобныя. Скурка тонкая, зеленавата-жоўтая з іржавымі плямамі. Мякаць белая, сакавітая, салодкая з лёгкім мускатным пахам, добрага смаку. Спажывецкая спеласць настае ў сярэдзіне верасня.

ТАЛСТАРО́ЖАЎ Георгій Барысавіч (н. 28.11.1945, г. Ліскі Варонежскай вобл., Расія), бел. фізік. Д-р фіз.-матэм. н. (1985), праф. (1993). Скончыў БДУ (1967). З 1967 у Ін-це фізікі, з 1992 у Ін-це малекулярнай і атамнай фізікі Нац. АН Беларусі. Навук. працы па люмінесцэнцыі складаных малекул у газавай фазе, рэлаксацыйных працэсах у біямалекулах. Даследаваў механізмы дысацыяцыі адзінарных сувязей у малекулах дысульфідаў. Адзін са стваральнікаў фемтасекунднага лазернага спектрометра. Прэмія Ленінскага камсамола 1978.

Тв.: Пассивная синхронизация мод фемтосекундного титан-сапфирового лазера при импульсной синхронной накачке ограниченным цугом пикосекундных импульсов (у саўт.) // Квантовая электроника. 1999. Т. 28, № 3; Спектроскопия и люминесценция (у саўт.) // Наука Беларуси в XX столетии. Мн., 2001.

ТАЛСТА́Я Таццяна Мікітаўна (н. 3.5.1951, С.-Пецярбург), руская пісьменніца. Унучка А.М.*Талстога* і М.Л.*Лазінскага*. Скончыла Ленінградскі ун-т. Друкуецца з 1983. У апавяданнях (зб-кі «На залатым ганку сядзелі...», 1987; «Кахаеш, не кахаеш», 1997), адметных назіральнасцю і вытанчанасцю стылю, — душэўная смута сучаснага чалавека, які перажывае разлад з рэчаіснасцю, страту маральных арыенціраў. У фантаст. рамане «Кысь» (2000) спалучэнне «чорнага» гумару з тонкай іроніяй і сатырай. Аўтар кніг эсэ, нарысаў, артыкулаў «Сёстры» (1998), «Двое» (2001, абедзве разам з сястрой Н.Талстой) і інш.

Тв.: День: Личное. М.. 2001; Ночь: Рассказы. М., 2001. *А.В.Спрынчан.*

ТАЛСТО́Й Аляксей Канстанцінавіч (5.9.1817, С.-Пецярбург — 10.10.1875), рускі пісьменнік. У 1835 вытрымаў экзамен на чын пры Маскоўскім ун-це. Займаў высокія дыпламатычныя (1837— 40) і прыдворныя пасады. З 1861 у адстаўцы. Першая фантаст. аповесць «Ваўкалак» (1841, пад псеўд. Краснагорскі). З 1854 у час. «Современник» друкаваў парадыйна-сатыр. вершы, напісаныя з братамі Жамчужнікавымі пад псеўд. *Казьма Пруткоў*. У творах «Сон Папова» (нап. 1873, апубл. 1878), «Гісторыя дзяржавы Расійскай...» (1883) высмейваў царскую бюракратыю, у рамане «Князь Сярэбраны» (1862), драм. трылогіі «Смерць Іаана Грознага» (1866), «Цар Фёдар Іаанавіч» (1868, не дазволена да пастаноўкі, паст. 1898), «Цар Барыс» (1870, паст. 1891) драматызм паліт. барацьбы ў Расіі 16—17 ст. Лірыка Т. мілагучная, псіхалагічна паглыбленая. Многія вершы пакладзены на музыку П.Чайкоўскім, М.Рымскім-Корсакавым, М.Мусаргскім, С.Рахманінавым і інш. П'еса Т. «Цар Фёдар Іаанавіч» пастаўлена Дзярж. рус. драм. т-рам Беларусі (1946). На бел. мову асобныя вершы Т. перакладаў Х.Жычка.

Тв.: Собр. соч. Т. 1—4. М., 1969; Соч. Т. 1—2. М., 1981; Полн. собр. стихотворений. Т. 1—2. Л., 1984.

Літ.: Стафеев Г.И. Сердце полно вдохновенья: Жизнь и творчество А.К.Толстого. Тула, 1973; Жуков Д. А.К.Толстой. М., 1982.

ТАЛСТО́Й Аляксей Мікалаевіч (10.1.1883, г. Пугачоў Саратаўскай вобл., Расія — 23.2.1945), рускі пісьменнік. Акад. АН СССР (1939). Вучыўся ў Пецярбургскім тэхнал. ін-це (1901—07). У 1914—16 ваен. карэспандэнт газ. «Русские ведомости». У 1918—23 у эміграцыі. Друкаваўся з 1905. Першая кніга — «Лірыка» (1907). Цыкл апавяданняў «Заволжа» (1909—11), раманы «Дзівакі» (1911), «Кудьгавы пан» (1912), п'еса «Галубка» (паст. 1916) пра жыццё маёнткавага дваранства. Вяршыні творчасці — трылогія «Блуканне па пакутах» (1920—41). Дзярж. прэмія СССР 1943, аднайм. фільм, серыі 1—3, 1957—59) — маст. летапіс шляхоў інтэлігенцыі ў гады рэвалюцыі і грамадз. вайны; раман «Пётр I» (кн. 1—3, не завершаны, 1929—45, Дзярж. прэмія СССР 1941, аднайм. фільм 1937—39), у ім раскрыў заканамернасці гіст. працэсу пятроўскай эпохі. Аўтар аўтабіягр. аповесці «Дзяцінства Мікіты» (1920), фантаст. раманаў «Аэліта» (1922—23), «Гіпербалоід інжынера Гарына» (1925—27), сатыр. рамана «Ібікус» (1924), ра-



А.М.**Талстой**.



Л.М.**Талстой**.

мана-памфлета «Чорнае золата» («Эмігранты», 1931), п'ес «Змова імператрыцы» (1925, з П.Шчогалевым; паводле п'есы Бел. тэлебачаннем паст. спектакль «Крах», 1966), «Азеф» (1926), драм. дылогіі «Іван Грозны» (1941—43, Дзярж. прэмія СССР 1946), аповесці-казкі «Залаты ключык, або Прыгоды Бураціна» (1935, экранізавана), публіцыст. і літ.-крытычных артыкулаў і інш. У 1917 Т. наведаў Беларусь як упаўнаважаны Усерас. саюза гарадоў на Зах. фронце. На бел. мову творы Т. перакладалі А.Бачыла, У.Ляўданскі, Я.Пушча і інш. П'еса «Нараджэнне свету» паводле трылогіі «Блуканне па пакутах» (інсцэніроўка І.Судакова) пастаўлена Бел. т-рам імя Я.Коласа (1948), п'еса «Дзялок» — Гродзенскім абл. драм. т-рам (1958), Дзярж. рус. драм. т-рам (1992), п'еса «Прыгоды Бураціна» — Бел. рэсп. т-рам юнага гледача (1966), п'еса «Прыгоды Бураціна ў Краіне Дурняў» А.Шапіры паводле Т. — Бел. дзярж. т-рам лялек (1991), п'еса «Касатка» — Нац. т-рам імя Я.Коласа (1992), п'еса «Любоў — кніга залатая» — Мінскім абл. драм. т-рам (1993).

Тв.: Полн. собр. соч. Т. 1—15. М., 1946—53; Бел. пер. — Жаўтухін. Мн., 1930; Пётр Першы. Кн. 1. Мн., 1937; Апавяданні Івана Сударава. Мн., 1946; Дзяцінства Мікіты. Мн., 1960; Залаты ключык, або Прыгоды Бураціна. Мн., 1971.

Літ.: Поляк Л.М. Алексей Толстой — художник. М., 1964; Петелин В.В. Судьба художника: Жизнь, личность, творчество А.Н.Толстого. М., 1982; Воспоминания об А.Н.Толстом. 2 изд. М., 1982; Петелин В.В. Жизнь Алексея Толстого: «Красный Граф». М., 2001. *А.Р.Жакаў.*

ТАЛСТО́Й Дзмітрый Андрэевіч (13.3.1823, Масква — 7.5.1889), граф, рас. дзярж. дзеяч, гісторык. Скончыў Царскасельскі ліцэй (1843). З 1848 служыў у дэпартаменце духоўных спраў Мін-ва ўнутр. спраў, з 1853 — у Марскім мін-ве. З 1861 сенатар, з 1866 чл. Дзярж. савета. У 1865—80 обер-пракурор Сінода, з 1866 міністр нар. асветы. Правёў рэформы сярэдняй адукацыі (1871), гар. вучылішчаў (1874), духоўных навуч. устаноў пры Сінодзе (1867, 1869). У 1882—89 міністр унутр. спраў Расіі і шэф корпуса жандараў. Прыхільнік «моцнай» улады, адзін з лідэраў паліт. рэакцыі 1880-х г. З дапамогай А.Дз.Пазухіна распрацаваў праекты «контррэформ»: «Закон аб земскіх участковых начальніках» (1889), «Палажэнне аб земскіх установах» (1896). З 1882 прэзідэнт Акадэміі навук. Аўтар прац «Гісторыя фінансавых устаноў Расіі з часоў заснавання дзяржавы да смерці імп. Кацярыны II» (1848), «Рымскі каталіцызм у Расіі» (1876). *Дз.У.Караў.*

ТАЛСТО́Й Леў Мікалаевіч (9.9.1828; Ясная Паляна Шчокінскага р-на Тульскай вобл., Расія — 20.11.1910), рускі пісьменнік. Вучыўся ў Казанскім ун-це (1844—47). У 1851—54 на вайск. службе на Каўказе. Дэбютаваў аповесцямі «Дзяцінства» (1852), «Гады падлетка» (1854), «Юнацтва» (1857) і ваен. апавяданнямі «Набег», «Высечка лесу». У 1854—55 удзельнічаў у абароне Севастопаля (маст. нарысы «Севастопаль у снежні месяцы», «Севастопаль у маі», «Севастопаль у жніўні 1855 г.», 1855—56). У 1859 адкрыў у Яснай Паляне школу для сял. дзяцей, выдаваў пед. час. «Ясная Поляна» (1862—63), пазней напісаў «Азбуку» (1872), «Новую азбуку» (1875). У аповесці «Казакі» (1863, не завершана) асэнсаванне ролі казацтва ў гіст. лёсе Расіі і ўсх. славянства. Раман-эпапея «Вайна і мір» (1863—69) — нябачаная ў л-ры новага часу з'ява паводле жанру, багацця і шырыні паказу нар. жыцця і гіст. падзей, па псіхал. распрацаванасці характараў; у ім выявілася тэндэнцыя пераходу ад пункту гледжання народа ва ўсім, з чаго складаецца жыццё чалавека, у форме гарманізацыі свету, збліжэння пачаткаў жыцця праз маральны, эстэт. рух дзеяння да нар. праўды, прастаты, шчырасці. Трагічныя старонкі еўрап. гісторыі, вайны, дыпламат. і прыдворнай маны, чалавечых смерцяў і няшчасцяў у ім ураўнаважваюцца старонкамі нар. гераізму, чалавечай любові, самаахвярнасці. У рамане «Ганна Карэніна» (1875—77) асэнсаваны шматлікія пласты паслярэформенага жыцця, калі «ўсё перавярнулася і пачынае ўкладвацца». У пач. 1880-х г. пасля працяглай і складанай эвалюцыі светапогляду Т. адкрыта абвясціў пра разрыў з афіц. царкоўнай дактрынай як пануючай ідэалагічнай сістэмай і пра пераход на пазіцыі «простага працоўнага народа». Ён напісаў шэраг філас.-публіцыст. трактатаў («Споведзь», 1879—80; «Даследаванне дагматычнага багаслоўя», 1879—84; «У чым мая вера?», 1883—84; «Дык што ж нам рабіць?», 1885—86, і інш.), у якіх абвінаваціў афіц. царкву ў падтрымцы і апраўданні вайны і насілля. У трактаце «Царства божае ўнутры вас» (1893, на

франц. мове; у Расіі забаронена, апубл. 1906) гал. аб'ектамі выкрывання сталі ваеншчына, мілітарызм, сац.-паліт. сілы, занятыя маральнай і эканам. падрыхтоўкай крывавых канфліктаў і сусв. вайны. Панарама жыцця з яго вечнымі пытаннямі дабра і зла, любові і нянавісці, смерці і бяссмерця прадстаўлена ў шматлікіх маст. празаічных («Халстамер», «Смерць Івана Ільіча», абодва 1886; «Крэйцэрава саната», 1891; «Айцец Сергій», 1911, і інш.) і драматычных («Улада цемры», 1886; «Плады асветы», 1890) творах. Складаныя пытанні мастацтва ў трактаце «Што такое мастацтва?» (1897—98). У канцы 19 ст. стварыў ўласную арыгінальную тэорыю, у аснове якой ідэя ненасілля — своеасаблівая «праграма міру» з універсальным комплексам маральных і сац.-этычных патрабаванняў. Найвышэйшую мэту ён бачыў у яднанні людзей і іх самаўдасканаленні праз адмаўленне служыць злу насілля. У рамане «Уваскрэсенне» (1899) праз лёс гал. герояў, праз іх блуканне па «крутах» чалавечай чысціні, падзенняў, пакут, духоўнага ўваскрэсення, па «кругах» жорсткай і бязлітаснай бюракратычнай машыны Т. паказаў праўдзівую і кантрастную карціну розных бакоў жыцця тагачаснай Расіі. У 1901 Сінод адлучыў Т. ад царквы. У творах апошніх дзесяцігоддзяў — драме «Жывы труп», аповесцях «Пасля балю» (абедзве апубл. 1911), «Хаджы-Мурат» (апубл. 1912), т.зв. нар. апавяданнях — дасягнуў незвычайнага майстэрства лаканічнага пісьма: тонкасць і глыбіня псіхал. аналізу суседнічаюць у іх з адкрытай пропаведдзю супраць антыгуманных, жорсткіх праяў грамадскага жыцця. Усё большае месца ў яго творчасці займала публіцыстыка, ён адгукаўся на балючыя і вострыя пытанні сучаснасці («Рабства нашага часу», «Не забі», абодва 1900; «Не магу маўчаць!», «Корань зла», абодва 1908, і інш.). Сусв. рэзананс атрымала яго антываен. публіцыстыка («Салдацкая памятка», «Афіцэрская памятка», абодва 1901; «Адумайцеся!», 1905). 10.11.1910 Т. пакінуў Ясную Паляну, па дарозе цяжка захварэў і на ст. Астапава (цяпер Леў Талстой Ліпецкай вобл.) памёр. Творчасць Т., якая выраслa на класічных традыцыях, стала эпохай свядомасці чалавецтва. Велізарнае ўздзеянне маст. адкрыццяў Т. на сусв. л-ру, у т.л. беларускую. Для стваральнікаў сучаснай бел. л-ры Я.Купалы і Я.Коласа асабліва значэнне меў талстоўскі пафас сцвярджэння і абароны мужыцкай праўды ў л-ры, нар. этыкі і мовы як вышэйшай нормы. Для ваен. прозы М.Гарэцкага Т. быў узорам мужнай, бязлітаснай шчырасці і праўды ў паказе вайны і чалавека на вайне, паслядоўнага антымілітарызму. Побач з Ф.Дастаеўскім і А.Бальзакам для К.Чорнага Т. з яго шырокім, эпічным поглядам на жыццё народа быў той мерай сталасці сучаснага рамана, якую бел. пісьменнік імкнуўся зрабіць нормай, традыцыяй і для бел. прозы. Талстоўскае сцвярджэнне праўды як гал. і нязменнага героя яго твораў арганічна ўласціва маст. талентам Я.Брыля і В.Быкава, І.Навуменкі і І.Шамякіна. Кожны з іх па-свойму ўспрыняў і працягвае талстоўскую традыцыю. І.Мележ у «Палескай хроніцы» апіраўся ў сваіх жанравых і маст. пошуках на эпічную традыцыю Т. Талстоўская мера шчырасці, спавядальнасці і бязлітаснай праўды ўплывае на таленты, найб. чулыя да рэальнага жыцця народа. Першыя пераклады твораў Т. на бел. мову апубл. ў газ. «Наша ніва» (10.3.1911, апавяданне «Воўк і сабака»). Газ. «Минское эхо» (8.7.1908), апубл. памфлет Т. «Не магу маўчаць!», газ. «Белорусский вестник» — урывак «Барадзіно» з рамана «Вайна і мір». Артыкул «Пра Л.М.Талстога і пралетарыят» Я.Окуня надрукавала газ. «Могилевский голос» (11.2.1906). Пра Т. і яго творы друкавалі матэрыялы газ. «Северо-Западный край», «Голос провинции», «Минский голос», «Минский курьер», «Гомельская мысль» і інш. Творы Т. на бел. мову перакладалі А.Астрэйка, Я.Брыль, Э.Валасевіч, В.Вітка, Ю.Гаўрук, М.Клімковіч, М.Лужанін, У.Ляўданскі, Л.Салавей, Я.Скрыган, А.Якімовіч і інш. Творчасць Т. даследавалі бел. літ.-знаўцы А.Адамовіч, Ф.Куляшоў, У.Сабаленка, даследуюць А.Несцярэнка, С.Чубакоў. Творы Т. ставілі т-ры Беларусі: «Улада цемры» Гродзенскі абл. драм. т-р (1959), Дзярж. рус. драм. т-р (1960), Бел. т-р імя Я.Коласа (1969), «Жывы труп» т-р імя Я.Коласа, Брэсцкі абл. драм. т-р (абодва 1951), Бел. т-р імя Я.Купалы (1961); «Ганна Карэніна» рус. драм. т-р (1938), Брэсцкі абл. драм. т-р (1950, 1961), т-р імя Я.Купалы (1951); «Уваскрэсенне» т-р імя Я.Купалы (1960); балет «Пасля балю» Г.Вагнера Дзярж. т-р оперы і балета Беларусі (1972).

Тв.: Полн. собр. соч. Т. 1—90. М., 1928—58; Собр. соч. Т. 1—22. М., 1978—85; Севастопольские рассказы. Мн., 1984; Детство. Отрочество. Юность. Мн., 1985; Бел. пер. — Ці шмат чалавеку трэба зямлі і др. апавяданьні. Вільня, 1928; Ад чаго зло на сьвеце. Вільня, 1929; Хаджы-Мурат. Мн., 1931; Васкрэсенне. Мн., 1937; Палікушка. Пасля бала. Мн., 1937; Севастопальскія апавяданні. Мн., 1937; Каўказскі нявольнік. Мн., 1941; Апавяданні для дзяцей. Мн., 1946; Аповесці і апавяданні. Мн., 1954; Смерць Івана Ільіча. Крэйцарава саната. Гаспадар і парабак. Мн., 1977.

Літ.: Гусев Н.Н. Л.Н.Толстой: Материалы к биогр. М., 1954—70; Гудзий Н.К. Лев Толстой. 3 изд. М., 1960; Шифман А.И. Лев Толстой и Восток. М., 1960; Вересаев В.В. Живая жизнь: О Достоевском и Л.Толстом ... М., 1991; Арденс Н.Н. Творческий путь Л.Н.Толстого. М., 1962; Яго ж. Достоевский и Толстой. М., 1970; Толстой и зарубежный мир. Т. 1—2. М., 1965; Бунин И.А. Освобождение Толстого // Собр. соч. М., 1967. Т. 9; Куприянова Е.Н. Эстетика Л.Н.Толстого. М.; Л., 1966; Чубаков С.Н. Лев Толстой о войне и милитаризме. Мн., 1973; Яго ж. «Все дело жизни»: (Лев Толстой и поиски мира). Мн., 1978; Ломунов К.Н. Лев Толстой в современном мире. М., 1975; Адамович А.М. Лев Толстой и белорусская литература: (Война и человек). Мн., 1978; Кулешов Ф.И. Л.Н.Толстой. Мн., 1978; Л.Н. Толстой в воспоминаниях современников. Ч. 1—2. М., 1978; Леў Талстой і Беларусь. Мн., 1981; Соболенко В.Н. Жанр романа-эпопеи: (Опыт сравнительного анализа «Войны и мира» Л.Толстого и «Тихого Дона» М.Шолохова). М., 1986; Опульская Л.Д. Роман-эпопея Л.Н.Толстого «Война и мир». М., 1987; Библиография литературы о Л.Н.Толстом, 1917—1958. М.. 1960; Тое ж, 1959—1961. М., 1965; Тое ж, 1962—1967. М., 1972; Тое ж, 1968—1973. М., 1978; Библиографический указатель литературы о Л.Н.Толстом, 1974—1978. М., 1990; Тое ж, 1979—1984. М., 1999. *А.М.Адамовіч, С.Н.Чубакоў.*

ТАЛСТО́Й Мікіта Ільіч (15.4.1923, г.Вршац, Сербія — 27.6.1996), рускі мовазнавец. Д-р філал. н. (1972), праф. (1973). Акад. АН СССР (1987). Чл. Аўстрыйскай АН, Македонскай акадэміі навук і мастацтваў. Скончыў Маск. ун-т (1950). З 1952 у Ін-це міжнар. адносін, з 1954 у Ін-це славяназнаўства АН СССР (з 1968 Ін-т славяназнаўства і балканістыкі Рас. АН), адначасова з 1968 выкладчык Маск. ун-та. Даследаваў гісторыю слав. літ. моў, слав. дыялекталогію, тапаніміку і этнаграфію. У працах шырока выкарыстоўваў бел. матэрыял. У 1962—65, 1974—81 узначальваў экспедыцыі па вывучэнні гаворак і традыц. духоўнай культуры Бел. Палесся. Рэдактар і сааўтар зб-каў «Лексіка Палесся: Матэрыялы для палескага дыялектнага слоўніка» і «Палессе» (Лінгвістыка. Археалогія. Тапаніміка)» (абодва 1968).

Тв.: Значение кратких и полных форм прилагательных в старославянском языке: (на материале евангельских кодексов) // Вопр. славян. языкознания. 1957. Вып. 2; Советское славяноведение: Краткий обзор лит., 1945—1963 гг. М., 1963 (у сааўт.); Славянская географическая терминология: Семасиологич. этюды. М., 1969; История и структура славянских литературных языков. М., 1988.

Літ.: Н.И.Толстой: Биобиблиогр. указ. славян. и общему языкознанию. Самарканд, 1983; Н.И.Толстой. М., 1993. *М.Н.Крыўко.*

ТАЛСТО́Й Пётр Аляксандравіч (1761—10.10.1844), расійскі ваен. і дзярж. дзеяч, дыпламат, ген. ад інфантэрыі (1814), граф. Удзельнік рус.-турэцкай вайны 1787—91, задушэння *паўстання 1794*, кааліцыйных войнаў супраць Францыі 1799—1800, 1805 і 1806—07. У 1807—08 пасол у Францыі. У час *вайны 1812* камандаваў рэзервовымі войскамі ў прыволжскіх губернях, нач. Ніжагародскага апалчэння. Удзельнік замежных паходаў 1813—14. Чл. Дзярж. савета (1823). У 1826 чл. Вярх. суда над дзекабрыстамі. У час задушэння *паўстання 1830—31* прызначаны 21.4.1831 галоўнакамандуючым 3-й рэзервовай арміяй з падпарадкаваннем яму Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губ. 12.6 і 22.6.1831 яму падпарадкаваны Гродзенская (з Беластоцкай вобл.) і Віленская губ. Фактычна кіраваў ліквідацыяй паўстання на тэр. Беларусі. *А.М.Лукашэвіч.*

ТАЛСТО́Й Пётр Андрэевіч (1645—10 або 18.2.1729), расійскі дзярж. дзеяч,

дыпламат, граф (1724). У час *Маскоўскага паўстання 1682* падбухторваў стральцоў супраць баяр Нарышкіных і *Пятра I*, пасля падзення царэўны *Соф'і Аляксееўны* (1689) перайшоў на бок Пятра І. Удзельнічаў у 2-м Азоўскім паходзе (1696), у 1697—98 вывучаў у Італіі марскую справу. У 1702—14 пасол у Турцыі. З 1714 сенатар, у 1716—17 суправаджаў Пятра І у паездцы па Еўропе. Дамогся вяртання з-за мяжы царэвіча *Аляксея Пятровіча* і ўзначаліў следства па яго справе. У 1718—26 кіраваў *Тайнай канцылярыяй*. У 1725 садзейнічаў узыходжанню на прастол *Кацярыны I*. З 1726 чл. Вярх. тайнага савета. У выніку разыходжання з А.Д.*Меншыкавым* па пытанні аб пераходзе ў спадчыну прастола ў 1727 арыштаваны і зняволены ў Салавецкі манастыр, дзе памёр. Пакінуў падарожныя нататкі за 1697—99, дзе ёсць звесткі пра бел. гарады і мястэчкі.

Тв.: Путешествие стольника П.А.Толстого по Европе, 1697—1699. М., 1992.



Ф.Талстой. Народнае апалчэнне 1812 г. Медальён з серыі, прысвечанай вайне 1812 г. 1816.

ТАЛСТО́Й Фёдар Пятровіч (21.2.1783, С.-Пецярбург — 25.4.1873), рускі медальер, скульптар, рысавальшчык і жывапісец; прадстаўнік класіцызму. З 1804 наведваў Пецярбургскую АМ, у 1825—28 яе выкладчык, з 1842 праф., з 1809 ганаровы чл., з 1828 віцэ-прэзідэнт, у 1859—68 таварыш (намеснік) прэзідэнта. Пэўны час быў звязаны з дзекабрыстамі. Творы вызначаюцца вытанчанасцю форм, паэт. успрыняццем антычнасці (барэльефы са сцэнамі з «Адысеі» Гамера і інш.). Выканаў 21 медальён у памяць вайны 1812 г. і замежных паходаў рус. арміі ў 1813—14. Аўтар ілюстрацый да паэмы І.Багдановіча «Душачка» (1820—33), жывапісных карцін, сілуэтных кампазіцый і інш.

ТАЛСТО́ЎСТВА, рэлігійна-філасофскі утапічны кірунак у грамадскай думцы Расіі канца 19 — пач. 20 ст. Узнікла пад уплывам рэліг.-філас. ідэй Л.М.*Талстога*, выкладзеных ім у творах «Споведзь», «У чым мая вера?» і абодва 1884), «Крэйцарава саната» (1891) і інш. Талстоўцы прапаведавалі «ўсеагульную любоў», «несупраціўленне злу насіллем», планавалі пераўтварэнне грамадства шляхам рэліг.-маральнага самаўдасканалення, вялі асветную дзейнасць. Створанае ў 1884 талстоўцамі У.Р.Чартковым і П.І.Біруковым выд-ва «Пасрэднік» выдавала масавымі тыражамі кнігі для народа: творы Талстога, А.П.Чэхава, Г.І.Успенскага і інш., дапаможнікі па аграноміі, ветэрынарыі, гігіене. У Цвярской, Сімбірскай, Харкаўскай губ., у Закаўказзі ўзніклі абшчыны талстоўцаў (т.зв. «культурныя скіты»). Т. мела паслядоўнікаў у Зах. Еўропе, Японіі, Індыі (М.К.*Гандзі*); спробы стварэння талстоўскіх абшчын рабіліся ў 1880—1900-я г. ў Англіі і Паўд. Афрыцы. Крытыка талстоўцамі правасл. царквы, афіц. рэлігіі, пропаведзь ураўняльных прынцыпаў і збліжэнне з сектамі (*малаканамі, духаборамі, штундызмам*) выклікалі незадавальненне царквы і ўлады. У 1897 Т. было абвешчана шкоднай сектай, у 1901 Талстой адлучаны ад царквы, а яго паслядоўнікаў арыштоўвалі і высылалі. У хуткім часе талстоўцы спынілі сваю дзейнасць.

ТАЛУА́НСКІ БАЛЬЗА́М, талуанскі бальзам [ад назвы г. Толу (Tolú) у Калумбіі], *бальзам*, які атрымліваюць падсочкай кары вечназялёных паўдн.-амер. дрэў міраксілон сям. бабовых. Вязкая бурая маса са смалістым пахам. Растваральнасць ў этаноле, не растваральнасць ў вадзе. Асн. кампаненты — свабодная *бензойная кіслата* і карычная к-та (3-фенілпрапенавая), іх эфіры (да 86%), *ванілін*. Выкарыстоўваюць у парфумерыі.

ТАЛУБЕ́ЕЎ Юрый Уладзіміравіч (1.5.1906, С.-Пецярбург — 28.12.1979), расійскі акцёр. Нар. арт. СССР (1956). Герой Сац. Працы (1976). Скончыў Ін-т сцэн. мастацтваў у Ленінградзе (1929). На сцэне з 1926 — акцёр ленінградскіх т-раў, з 1942 у т-ры драмы імя А.Пушкіна. Мастацтва Т. вызначалася майстэрствам рэаліст. абмалёўкі характараў, пластычнай выразнасцю, гумарам, глыбінёй маст. абагульнення пры прастаце і арганічнасці ігры. Сярод роляў: Гараднічы («Рэвізор» М.Гогаля), Бубноў («На дне» М.Горкага), Важак («Аптымістычная трагедыя» У.Вішнеўскага), Палоній («Гамлет» У.Шэкспіра), Вілі Ломен («Смерць коміваяжора» А.Мілера) і інш. Зняўся ў фільмах «Рэвізор», «Дон Кіхот», «Гамлет», «Аварыя» і інш. Дзярж. прэмія СССР 1947. Ленінская прэмія 1958. Дзярж. прэмія Расіі 1970.

ТАЛУІДЗІ́НЫ, амінаталуолы, метыламіны, амінавытворныя *талуолу*, $CH_3C_6H_4NH_2$.

Існуюць 3 ізамеры: 2-амінаталуол (*орта*-Т. — вадкасць, $t_{кіп}$ 200,3 °С, шчыльн. 998,4 кг/м³); 3-амінаталуол (*мета*-Т. — вадкасць, $t_{кіп}$ 203 °С, шчыльн. 989,1 кг/м³); 4-амінаталуол (*пара*-Т. — цвёрдае рэчыва, $t_{пл}$ 44,5—45 °С, $t_{кіп}$ 200,5 °С, шчыльн. 961,9 кг/м³). Добра растваральнікі ў арган. растваральніках, мала — у вадзе. Характэрныя хім. ўласцівасці араматычных *амінаў*. Лёгка акісляюцца (у паветры на святле цямнеюць), утвараюць солі. У прам-сці атрымліваюць гідрагенізацыяй адпаведных нітраталуолаў у прысутнасці каталізатараў (медзь, нікель, паладый). Выкарыстоўваюць Т. і іх вытворныя ў вытв-сці амінаталуолсульфонавых кіслот, крэзолаў, азафарбавальнікаў, трыарылметанавых і сярністых фарбавальнікаў; *п*-Т. як кампанент інгібітараў карозіі. Атрутныя (найб. таксічны *п*-Т.) усмоктваюцца скурай, ГДК 3 мг/м³. *Я.Г.Міляшкевіч.*

ТАЛУО́Л, метылбензол, араматычны вуглевадарод, $C_6H_5CH_3$. У 1838 вылучаны франц. хімікам А. Сент-Клер Дэвілем з *талуанскага бальзаму* (адсюль назва Т.).

Бясколерная вадкасць, $t_{пл}$ 110,62 °С, шчыльн. 866,9 кг/м³. Добра растваральна ў большасці арган. растваральнікаў, мала — у вадзе. Рэакцыі замяшчэння ў бензольным ядры адбываюцца лягчэй, чым у бензоле (гл. *Араматычныя злучэнні*). Пры акісленні па CH_3-групе ў залежнасці ад умоў утвараюцца *бензілавы спірт, бензойны альдэгід* або *бензойная кіслата*. У прам-сці вылучаюць з каменнавугальнай смалы, прадуктаў каталітычнага рыформінгу бензінаў. Выкарыстоўваюць пераважна ў вытв-сці бензолу, фенолу, капралактаму, нітраталуолаў (тратылу) і інш., а таксама як растваральнік для палімераў, нітрацэлюлозных, алкідных лакаў і эмалей, высокаактанавы кампанент бензінаў. Аказвае слабае наркатычнае ўздзеянне, ГДК 50 мг/м³. *Я.Г.Міляшкевіч.*

ТАЛЫ́ШСКІЯ ГО́РЫ, Талыш, горы на ПдУ Каўказа, у Азербайджане, на граніцы з Іранам. Працяг сістэмы *Малога Каўказа*. Аддзелены ад яго прагінам з далінай р. Аракс. Складаецца з 3 падоўжных хрыбтоў. Выш. да 2492 м. Пераважаюць флішавыя і вулканагенныя тоўшчы з інтрузіямі асн. парод. Сейсмічнасць. На схілах — субтрапічныя лясы гірканскага тыпу (дуб, дзелква, жалезнае дрэва, бук), на грэбені — нагорныя ксерафіты і горныя лугастэпы.

ТАЛЬ, вёска ў Любанскім р-не Мінскай вобл., каля Любанскага вадасх., на аўтадарозе Любань—Урэчча. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 8 км на ПнЗ ад г. Любань, 144 км ад Мінска, 12 км ад чыг. ст. Урэчча. 1395 ж., 650 двароў (2002). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, амбулаторыя, аптэка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Царква св. Тройцы. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ТАЛЬ (ад галанд. talie), падвесны грузападымальны механізм з ручным, электрычным або мех. прыводам. Ручныя Т. бываюць стацыянарныя і перасоўныя, грузападымальнасцю 0,1—10 т. Эл. Т. звычайна маюць грузападымальнасць 0,25—10 т, вышыню пад'ёму да 30 м. Падвесныя пуці для іх маюць 1 або 2 рэйкі, стрэлкі, закругленні, невял. нахілы. Пнеўматычныя Т. — грузападымальнасцю да 0,1 т, выкарыстоўваюцца там, дзе эл. ток недапушчальны па ўмовах вытв-сці. Гл. таксама *Тэльфер*. *С.В.Багдановіч.*

ТАЛЬ Міхаіл Нехем'евіч (н. 9.11.1936, Рыга — 28.6.1992), латвійскі і рас. шахматыст. Гросмайстар СССР, міжнар. гросмайстар (1957). Засл. майстар спорту СССР (1960). Скончыў Латвійскі ун-т (1958). У 1960—70 гал. рэдактар час. «Шахматы» (Рыга). Чэмпіён свету (1960—61), 8-ы ў гісторыі шахмат. 3-разовы чэмпіён свету сярод студэнтаў у камандным заліку. Чэмпіён свету па «маланкавай» гульні (1988). У складзе зборных каманд СССР 8-разовы пераможца Сусв. шахматных алімпіяд (1958—74). 6-разовы чэмпіён Еўропы. Чэмпіён СССР (1957, 1958, 1967, 1972, 1974, 1978), сярэбраны (1959, 1962, 1971, 1974) і бронз. (1964) прызёр. Пераможца міжнар. турніраў (1959—87).

Тв.: Матч Ботвинник—Таль. Рига, 1961; В огонь атаки. М., 1978 (разам з Я.У.Дамскім); Когда оживают фигуры. М., 1983.

ТА́ЛЬВЕГ (ням. Talweg ад Tal даліна + Weg дарога), лінія, якая злучае самыя нізкія пункты дна рачной даліны, лагчыны, яра і інш. эразійных форм рэльефу.

ТАЛЬЁНІ (Taglioni), сям'я італьянскіх артыстаў балета, балетмайстраў. Філіпа Т. (5.11.1777, г. Мілан — 11.2.1871), педагог і харэограф-рэфарматар, стваральнік рамант. балета. З 1794 працаваў у т-рах Італіі, Германіі, Аўстрыі, а таксама ў Стакгольме і Парыжы. Сярод паст.: «Сільфіда» Ж.Шнейцгофера (1832), «Дзева Дуная» (1836) і «Марскі рабаўнік» (1840) А.Адана і інш. Шмат балетаў ставіў для дачкі. Марыя Т. (23.4.1804, Стакгольм — 22.4.1884), дачка Філіпа Т., адна са знакамітых танцоўшчыц эпохі рамантызму. У 1822—47 выступала на сцэне, у 1828—35 вядучая салістка Парыжскай оперы. У 1837—42 выступала ў С.-Пецярбургу. Увяла танец на пуантах, лёгкі сцэн. касцюм. Яе танец вылучаўся адухоўленасцю і грацыёзнасцю. Сярод партый: Сільфіда («Сільфіда»), Наталі («Наталі, ці Швейцарская малочніца» А.Гіраўца), Зюльма («Паўстанне ў сералі» Т.Лабара), Флёр дэ Шан («Дзева Дуная»), графіня Анджэла («Цень» Л.Маўрэра) і інш. Яе творчасць паўплывала на развіццё балетнага мастацтва. Поль Т. (Паала, 1808–1884), сын Філіпа Т., часта выступаў з Марыяй Т. ў гарадах Еўропы; ставіў балеты ў Лондане, Мілане. У 1856—83 балетмайстар Берлінскай оперы.

ТАЛЬК (араб.), мінерал падкласа слаістых сілікатаў, гідрасілікат магнію, $Mg_3[Si_4O_{10}](OH)_2$. Мае ў сабе аксід магнію (MgO) да 31,7%, прымесі аксіду жалеза (FeO) да 5%, нікелю, марганцу, алюмінію, натрыю, тытану і інш. Крышталізуецца ў трыкліннай сінганіі. Утварае дробналускаватыя або сланцаватыя масы, тонкакрышт. масіўныя агрэгаты (стэатыт), буйнапласціністыя ўтварэнні і інш. Колер белы, зеленаваты, чырвоны, буры, чорны. Цв. 1. Шчыльн. 2,6—3 г/см^3. Утвараецца пры метамарфізме магматычных і асадкавых карбанатных



Таль: 1 — ручная чарвячная; 2 — электрычная.

магнезіяльных парод. Выкарыстоўваецца ў папяровай, гумавай, парфумернай, лакафарбавай, тэкст., керамічнай, кабельнай, металургічнай, мед. прам-сці; стэатыт — вырабны камень. Радовішчы ў Расіі, Канадзе, Аўстрыі і інш.



М.**Тальёні** ў ролі Сільфіды.



Тальк.

ТА́ЛЬКА, Гарэлецкі канал, рака ў Пухавіцкім р-не Мінскай вобл., правы прыток р. Свіслач (бас. р. Дняпро). Даўж. 32 км. Пл. вадазбору 341 км^2. Пачынаецца на меліяраваным балоце Гала за 1,5 км на ПнУ ад в. Ліпнікі, вусце за 1,8 км на Пн ад в. Талька. Цячэ па Цэнтральнабярэзінскай раўніне. Рэчышча каналізаванае.

ТА́ЛЬКА (Talca), горад у цэнтр. ч. Чылі, у Падоўжнай даліне. Адм. ц. вобласці Маўле. Засн. ў 1692. Каля 180 тыс. ж. (2001). Вузел чыгунак і аўтадарог. Аэрапорт. Прам-сць: харчасмакавая, у т.л. вінаробная, тытунёвая і мукамольная; дрэваапр., запалкавая, папяровая, абуткавая, спірта-гарэлачная, чорная металургія. Музеі: Б.*О'Хігінса*, выяўл. мастацтваў і музыкі.

ТА́ЛЬКА, вёска ў Пухавіцкім р-не Мінскай вобл., на р. Талька, на аўтадарозе, якая злучае вёску з г. Мар'іна Горка; чыг. ст. на лініі Асіповічы—Мінск. Цэнтр сельсавета. За 21 км на ПдУ ад г. Мар'іна Горка, 83 км ад Мінска. 443 ж., 213 двароў (2002). Аграфірма «Верасень», лясніцтва, цэх па перапрацоўцы драўніны, санаторый-прафілакторый «Талька». Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан. Магіла ахвяр фашызму. У Вял. Айч. вайну каля чыг. ст. Т. партызаны правялі *Талькаўскую аперацыю 1942*.

ТА́ЛЬКА-ГРЫНЦЭ́ВІЧ Юльян Дамінікавіч (18.8.1850, б. маёнтак Рукшаны, Каўнаскі пав., Літва — 26.4.1936), антраполаг, этнограф. Чл. Польскай акадэміі навук у Кракаве. Скончыў Кіеўскі ун-т (1876). У 1878—91 працаваў урачом на Украіне. У 1894—1908 узначальваў музей Троіцка-Кяхцінскага аддз. Рус. геагр. т-ва. З 1908 праф. антрапалогіі Ягелонскага ун-та ў Кракаве. У 1911 арганізаваў кафедру антрапалогіі ў Віленскім ун-це. Аўтар прац па гігіене, антрапалогіі, этнаграфіі і археалогіі. Вывучаў фізічны тып стараж.-ўсх. славян, у т.л. беларусаў.

Тв.: К антропологии народностей Литвы и Белоруссии. СПб., 1894; К антропологии великороссов. Томск, 1898. *Л.І.Цягака.*

ТАЛЬКАУА́НА (Talcahuano), горад у цэнтр. ч. Чылі. Засн. ў 18 ст. Каля 270 тыс. ж. (2001). Порт на Ціхім ак., аванпорт г. Кансепсьён (вываз с.-г. прадукцыі). Цэнтр рыбалоўства і рыбнай прам-сці. Прам-сць: харч., маш.-буд., нафтахім., цэментная. Паблізу металургічны з-д.

ТА́ЛЬКАЎСКАЯ АПЕРА́ЦЫЯ 1942, аперацыя па падрыве чыг. моста цераз р. Талька каля аднайм. чыг. станцыі Пухавіцкага р-на Мінскай вобл. на лініі Мінск—Асіповічы 9 кастр. ў Вял. Айч. вайну. Гарнізон аховы моста (каля 40

чал.) быў умацаваны 4 дзотамі, гарматай, 2 станковымі і 3 ручнымі кулямётамі; гарнізон на станцыі налічваў каля 300 чал., меў тэлеф. сувязь. Аперацыю праводзілі партыз. атрады (140 партызан) «Полымя» (камандзір Я.Ф.*Філіпскіх*) і імя Сталіна (У.А.*Ціхаміраў*) з дапамогай падпольшчыкаў ст. Талька. Увечары 8 кастр. партызаны перакрылі шляхі падыходу падмацаванняў праціўніка да моста, замініравалі чыг. пуці да ст. Талька, адначасова напалі на ахову моста і чыг. станцыі. Пасля здзяйснення аперацыі партызаны з трафеямі арганізавана адышлі. У выніку аперацыі рух паяздоў спынены на 12 сутак.

Літ.: Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941—1945: Энцыкл. Мн., 1990.

ТАЛЬМА́ (Talma) Франсуа Жазеф (15.1.1763, Парыж — 19.10.1826), французскі акцёр, педагог. Скончыў Каралеўскую школу дэкламацыі і спеваў у Парыжы. У 1787—91, з 1799 у т-ры «Камеды Франсэз» у Парыжы, у 1791—99 удзельнічаў у стварэнні і рабоце «Тэатра Рэспублікі». З 1806 праф. драм. класа Парыжскай кансерваторыі. Акцёр класіцысцкай трагедыі. Мастацтву характэрны ідэалізацыя і манументальнасць вобразаў у спалучэнні з вял. эмацыянальнасцю. Выступаў пераважна ў тагачасным рэпертуары, з пач. 19 ст. — у трагедыях У.Шэкспіра: Макбет, Атэла, Гамлет (аднайм. п'есы). Рэфарматар сцэн. касцюма і грыма. Аўтар тэатр. мемуараў (1931).

Літ.: Дейч А.И. Франсуа-Жозеф Тальма. М., 1973.

ТАЛЬТЭ́КІ, індзейскі народ моўнай групы наўа. У 8 ст. н.э. Т. ўварваліся з Пн у Цэнтр. Мексіку і ў 9 ст. стварылі дзяржаву са сталіцай у Талане (цяпер Тула), якая ахоплівала б.ч. Цэнтр. Мексікі. Стварылі высокаразвітую культуру. У 10 ст. Т. падпарадкавалі народ *майя* на п-ве Юкатан, у выніку чаго ўзнікла змешаная майя-тальтэкская культура. Уварванне ў канцы 12 ст. плямён чычымекаў знішчыла дзяржаву Т., але іх культ. традыцыі зрабілі вял. ўплыў на далейшае развіццё культуры народаў Мексікі, у т.л. *ацтэкаў*.

ТАЛЬЯ́Н Шара Мкртычэвіч (28.7.1893, Тбілісі — 7.11.1965), армянскі спявак (тэнар, потым барытон). Нар. арт. Арменіі (1939). Вучыўся ў Петраградскай кансерваторыі (1916—18). Выступаў у оперных і аперэтачных трупах, ашугскіх ансамблях (часам іх арганізатар). Адзін з заснавальнікаў армянскіх т-ра оперы і балета (1933; да 1954 яго саліст), т-ра муз. камедыі (1942). Адзін з вядучых выканаўцаў партый у нац. оперным рэпертуары: Аршак («Аршак II» Т.Чухаджана), Саро («Ануш» А.Тыграняна) і інш., а таксама нар., гусанскіх і ашугскіх песень. Складальнік і рэдактар (з М.Агаянам) зб.-каў песень Саят-Навы (1946, 2-е выд. 1963) і Джывані (1955). Аўтар успамінаў «Падзеі, асобы, думы» (1973). Дзярж. прэмія СССР 1946.

ТАЛЬЯ́ЦІ (Togliatti) Пальміра (26.3.1893, г. Генуя, Італія — 21.8.1964), італьянскі паліт. і дзярж. дзеяч, дзеяч італьян. і міжнар. камуніст. руху. Паводле адукацыі юрыст. Скончыў Турынскі ун-т (1915). Чл. Італьян. камуніст. партыі з моманту заснавання (1921), з 1926 яе ген. сакратар. Неаднаразова быў арыштаваны фаш. ўладамі Італіі. У 1926—44 у эміграцыі. З 1924 чл., з 1935 сакратар Выканкома *Камуністычнага Інтэрнацыянала*. У 1937—39 упаўнаважаны Выканкома Камінтэрна па аказанні дапамогі рэсп. ўраду Іспаніі ў вайне супраць франкісцкіх мяцежнікаў і італа-герм. інтэрвентаў (гл. *Іспанская рэвалюцыя 1931—39*). Міністр без партфеля, міністр юстыцыі, нам. прэм'ер-міністра ў італьян. урадах 1944—46. Удзельнік распрацоўкі рэсп. канстытуцыі Італіі (1947). Дэп. парламента з 1948. Працы па тэорыі і практыцы рабочага руху і інш. У гонар Т. названы г. *Тальяці* ў Самарскай вобл. (да 1964 Стаўрапаль).

ТАЛЬЯ́ЦІ, горад, цэнтр Стаўрапольскага р-на ў Самарскай вобл. Расіі. Засн. ў 1737 як крэпасць Стаўрапаль. Горад з 1780. Перайменаваны ў гонар П.*Тальяці* (1964). 723 тыс. ж. (2000). Порт на р. Волга (Куйбышаўскае вадасх.). Чыг. станцыя. Найбуйн. ў Расіі цэнтр вытв-сці легкавых аўтамабіляў. Прам-сць: машынабудаванне і металаапр. (гал. прадпрыемства АТ «Аўтаваз», вытв-сць трансфарматараў, суднарамонтна-мех. і электратэхн. з-ды), хім. (мінер. ўгнаенні, сінт. каўчук), харч., лёгкая. Вытв-сць буд. матэрыялаў. Паліграф. прадпрыемства «Сучаснік». Політэхн. ін-т. Тэатры: драм., лялек. Краязн. музей. Пры буд-ве Волжскай (Куйбышаўскай) ГЭС горад трапіў у зону затаплення і ў сярэдзіне 1950-х г. перанесены на новае месца.

ТАМ Ігар Яўгенавіч (8.7.1895, г. Уладзівасток, Расія — 12.4.1971), расійскі фізік-тэарэтык; заснавальнік навук. школы па тэарэт. фізіцы. Акад. АН СССР (1953, чл.-кар. 1933). Замежны чл. Амер. акадэміі мастацтваў і навук (1961) і АН інш. краін. Герой Сац. Працы (1953). Скончыў Маскоўскі ун-т (1918). Выкладаў у ВНУ Сімферопаля і Адэсы. У 1924—41 і 1954—57 у Маскоўскім ун-це (з 1930 праф., заг. кафедры). З 1934 у Фіз. ін-це АН СССР (заг. аддзела). У 1948—53 удзельнічаў у стварэнні першай вадароднай бомбы ў СССР. Навук. працы па квантавай механіцы, тэорыі цвёрдага цела, ядз. фізіцы, фізіцы элементарных часціц і касм. прамянёў і інш. Стварыў квантавую тэорыю рассеяння святла ў крышталях (1930). Заклаў асновы квантава-мех. тэорыі фотаэфекту ў металах (1931; з С.П.Шубіным). Прадказаў існаванне звязаных энергет. станаў электрона на паверхні крышталя (узроўні Т.; 1932). Заклаў асновы палявой тэорыі парных ядз. сіл (1934; адначасова з Дз.Дз.*Іваненкам*). Прадказаў наяўнасць у нейтрона магн. моманту (1934; з С.А.*Альтшулерам*). Стварыў тэорыю *Чаранкова—Вавілава выпрамянення* (1937; з І.М.*Франкам*). Даказаў суадносіны невызначальнасці «энергія—час» у нерэлятывісцкай квантавай механіцы (1945; з Л.І.*Мандэльштамам*). Распрацаваў тэорыю магн. тэрмаядз. рэактара (1950; з А.Дз.*Сахаравым*). Нобелеўская



І.Я.**Там**.

прэмія 1958 (з Франкам, П.А.*Чаранковым*). Дзярж. прэміі СССР 1946, 1953. Вялікі залаты медаль імя М.В.Ламаносава АН СССР 1967.

Тв.: Нобелевские лекции. М., 1960 (разам з П.А.Чаранковым, І.М.Франкам); Собр. научных трудов. Т. 1—2. М., 1975; Основы теории электричества. 10 изд. М., 1989.

Літ.: Воспоминания о И.Е.Тамме. 2 изд. М., 1986; Фейнберг Е.Л. И.Е.Тамм // Успехи физ. наук. 1995. Т. 165, вып. 7; Капица. Тамм. Семенов: В очерках и письмах. М., 1998.

М.М.Касцюковіч.

ТАМА́ ДЭ ТАМО́Н (Thomas de Thomon) Жан (12.4.1760, Берн — 4.9.1813), расійскі архітэктар. Па паходжанні француз. Акад. Пецярбургскай АМ (1800). Вучыўся ў Парыжскай АМ і ў Рыме (1780-я г.). Творча перапрацоўваў прыёмы ант. дойлідства на аснове традыцый рус. класіцызму. Творы адметныя падкрэслена буйнымі формамі, прастатой аб'ёмна-прасторавых вырашэнняў, лаканізмам дэкар. апрацоўкі: Біржа (1805—10) у Пецярбургу, маўзалей у г. Паўлаўск (Ленінградская вобл.; 1805—08), шпіталь у г. Адэса (1806—21), Калона Славы ў г. Палтава (абодва Украіна; 1811, скульпт. Ф.Шчадрын), узорныя (тыпавыя) праекты казённых і жылых будынкаў для гарадоў Расіі (1806—07). Аўтар альбомаў графікі «Успаміны пра Італію».

Літ.: Шуйский В. Тома де Томон. Л., 1981.

ТАМАГА́ЎК, тамагік, тамахаак, ударная кідальная і сякучая халодная зброя ў некат. плямён паўн.-амер. індзейцаў (шліфаваная каменная сякера з драўляным дзяржаннем, паліца з шарападобным навершам). У 16—18 ст. еўрапейцамі былі завезены медныя і жалезныя Т. (у форме сякерак). Дзяржанні Т. часта ўпрыгожваліся пёрамі і малюнкамі або піктаграфічнымі знакамі. У ваен. абрадах індзейцаў Т. меў сімвалічнае значэнне: пафарбаваны ў чырв. колер, ён служыў знакам абвяшчэння вайны або прапановай для ваен. саюза. Выраз «пахаваць Т.» азначаў «заключыць мір».

ТАМАГРАФІ́Я (ад грэч. tomos частка, слой + *...графія*), метад паслойнага даследавання ўнутр. структуры аб'екта з атрыманнем адлюстравання яго асобных «зрэзаў» (тамаграм). Адрозніваюць Т. рэнтгенаўскую камп'ютэрную, магнітарэзанансную, пазітронна-эмісійную, акустычную, лазерную і інш. Выкарыстоўваюць у дыягностыцы хвароб розных органаў, напр., лёгкіх (пухліны, кісты, іншародныя целы), сэрца, касцей і суставаў. *І.М.Семяненя.*

ТАМА́Ё МЕ́НДЭС (Tamayo Méndez) Арнальда (н. 29.1.1942, г. Гуантанама, Куба), першы касманаўт Кубы. Герой Сав. Саюза (1980), Герой Рэспублікі Куба (1980). Касманаўт Рэспублікі Куба (1980). Палкоўнік. Скончыў Тэхнал. ін-т (1961, г. Гавана), Ейскае вышэйшае ваен. авіяц. вучылішча лётчыкаў (1962, СССР), Вышэйшую школу Рэв. Узбр. сіл імя М.Гомеса. З 1978 у Цэнтры падрыхтоўкі касманаўтаў імя Ю.А.Гагарына. 18—26.9.1980 з Ю.В.*Раманенкам* здзейсніў (як касманаўт-даследчык) палёт на касм. караблі «Саюз-38» і арбітальнай станцыі «Салют-6» (асн. экіпаж Л.І.*Папоў*, В.В.*Румін*). Правёў у космасе 7,9 сут. *У.С.Ларыёнаў.*



Ж.**Тама дэ Тамон**. Калона Славы ў г. Палтава (Украіна).



Тамагаўк: 1 — абцягнутая скурай шарападобная дубіна (булава) апачаў; 2 — стальная сякера асагаў.



А.**Тамаё Мендэс**.



С.**Таманага**.

ТАМА́ЛЕ (Tamale), горад на Пн Ганы. Адм. ц. Паўн. вобласці. Каля 200 тыс. ж. (2001). Вузел аўтадарог. Аэрапорт. Гандл. цэнтр. Прам-сць: тэкст., харч., маш.-буд., першасная апрацоўка с.-г. сыравіны.

ТАМАНА́ГА Сін'ітыра (31.3.1906, г. Кіёта, Японія — 8.7.1979), японскі фізіктэарэтык; адзін са стваральнікаў квантавай электрадынамікі. Чл. Японскай АН (1951). Замежны чл. АН СССР (1971). Скончыў ун-т г. Кіёта (1929). З 1932 у Ін-це фіз. і хім. даследаванняў, у 1941—69 праф. Такійскага ун-та (у 1956—62 яго прэзідэнт). Адначасова ў 1963—69 дырэктар Ін-та аптычных даследаванняў і прэзідэнт Навук. савета Японіі. Навук. працы па квантавай тэорыі поля, квантавай электрадынаміцы, ядз. фізіцы, фізіцы элементарных часціц і касм. прамянёў. Прадказаў мезаатамы (1940), прапанаваў каварыянтную фармулёўку квантавай тэорыі поля (1942). Распрацаваў т. зв. звышмнагачасавы фармалізм (1946), што прывяло да ўзнікнення квантавай электрадынамікі. Нобелеўская прэмія 1965 (з Р.Ф.*Фейнманам*, Дж. *Швінгерам*). Залаты медаль імя М.В.Ламаносава АН СССР (1964).

Тв.: Рус. пер. — Развитие квантовой электродинамики // Успехи физ. наук. 1967. Т. 91, вып. 1.

Літ.: Дайсон Ф. Томонага, Швингер и Фейнман — лауреаты Нобелевской премии по физике // Успехи физ. наук. 1967. Т. 91, вып. 1. *А.І.Болсун.*

ТАМА́НЕРХОР (Thomanerchor), хор хлопчыкаў у г. Лейпцыг (Германія). Засн. ў сярэдзіне 13 ст. пры Томаскірхе. З канца 17 ст. ўдзельнічаў і ў свецкіх святах. У 1723—50 хор узначальваў І.С.Бах, які стварыў для яго шмат твораў. У 20 ст. адзін з цэнтраў захавання бахаўскіх традыцый у хар. музыцы.

ТАМА́НСКІ ПАЎВО́СТРАЎ, Таманьскі п-аў. У Перадкаўказзі, у Краснадарскім краі, у Расіі; абмываецца на Пн Азоўскім м., на Пд Чорным м. Пл. каля 2 тыс. км^2. Выш. да 164 м. Берагі нізкія, парэзаныя залівамі і лімананамі. Складзены з астравоў, якія ў 5 ст. злучыліся паміж сабой наносная сушаю. Былыя астравы ўяўляюць сабой гліністыя купалападобныя грады з 25 газевымі вулканамі. У паніжэннях паміж градамі — азёры-ліманы з салёнай вадою. Выхады нафты і гаручых газаў, радовішчы жал. руды. У 6 ст. да н.э. на берагах Т.п. існавалі стараж.-грэч. калоніі Германаса, Фанагорыя, Кепы і інш.); у 5 ст. да н.э. тэр. Т.п. ў складзе *Баспорскай дзяржавы.*

ТАМА́НЯН Аляксандр Іванавіч (16.3.1878, г. Краснадар, Расія — 20.2.1936), армянскі архітэктар. Нар. архітэктар Арменіі (1924). Скончыў Пецярбургскую АМ (1904). У ранніх творах распрацоўваў прынцыпы класіцызму. Стварыў першы генплан рэканструкцыі Ерэвана (1924), праекты планіроўкі гарадоў Гюмры (1925), Эчміядзін (1927—28) і інш. У многіх работах 1920-х г. у Ерэване выкарыстоўваў кампазіцыйныя прыёмы класіцызму: будынкі фізіятэрапеўтычнага, зоаветэрынарнага, політэхн. ін-таў, абсерваторыя і анатомікум медыцынскага ін-та. Звяртаўся да творчай перапрацоўкі традыцый арм. сярэдневяковага дойлідства, выкарыстоўваў народы мясц. каменю: Т-р оперы і балета (1926—53), Дом урада (1926—41) і інш. у Ерэване. Дзярж. прэмія СССР 1942.

Літ.: Яралов Ю.С. Таманян. М., 1950.

ТАМА́РА, Тамар (сярэдзіна 11б0-х г. — 1207), царыца Грузіі [1184—1207]. Прадаўжала дзейнасць *Давіда Будаўніка* па аб'яднанні Грузіі. Груз. войскі перамаглі азерб. атабека Абубекра і яго саюзнікаў каля Шамхора (1194), румскага султана Рукнаддзіна каля Басіяні (1202), узялі г. Карс (1204) і падпарадкавалі ўладзе Т. амаль усё Закаўказзе. Пры Т. развіваўся гандаль, раслі гарады, узводзіліся крэпасці, цэрквы і манастыры, развіваліся л-ра і мастацтва, пабудаваны караванная дарога Тбілісі — Джавахеты, Алазанскі і Самхорскі каналы. Т. прысвечаны оды Чахрухадзе, Шаўтэлі, «Віцязь у тыгравай шкуры» Ш.*Руставелі*. У 1185 стала жонкай князя Юрыя — сына вял. князя ўладзімірскага Андрэя Багалюбскага, у 1189 — жонкай Давіда Саслані, прадстаўніка асецінскай галіны груз. *Багратыёнаў.*

ТАМА́РА ХАНУ́М (сапр. Петрасян Тамара Арцёмаўна; 29.3.1906, г. Фергана, Узбекістан — 1991), узбекская танцоўшчыца, спявачка, балетмайстар. Нар. арт. СССР (1956). Скончыла Цэнтр. тэатр. тэхнікум у Маскве (1925). З 1919 у агітбрыгадзе пад кіраўніцтвам Х.Хамзы, з 1926 у канцэртна-этнатр. ансамблі М.Кары-Якубава. У 1929—34 салістка і адна з арганізатараў Узб. муз.-драм. т-ра. З 1936 салістка, у 1941—69 маст. кіраўнік арганізаванага ёю ансам-

бля Узб. філармоніі. Збіральніца песеннага і танц. фальклору народаў свету. Рэфарматар выканальніцкага стылю узб. жаночага танца. Удзельнічала ў станаўленні узб. балетнага т-ра. У рэпертуары песні і танцы многіх народаў свету. Дзярж. прэмія СССР 1941.

Літ.: Широкая О. Тамара Ханум. Ташкент, 1973.





Тамара Ханум.

М.М.Тамашэвіч.

І.Г.Тамашэўскі.

ТАМАРЫ́КС, т а м а р ы с к, род кветкавых раслін, тое, што *грабеншчык*.

ТАМА́РЫН Ілья Лявонавіч (24.11.1893, г. Гродна — 25.5.1961), бел. вучоны ў галіне фтызіятрыі. Д-р мед. н. (1940), праф. (1941). Скончыў Харкаўскі мед. ін-т (1922). У 1929—39 у Днепрапятроўскім мед. ін-це, з 1939 нам. дырэктара Ялцінскага туберкулёзнага ін-та, з 1940 у ін-це ўдасканалення ўрачоў у Днепрапятроўску (дырэктар клінікі туберкулёзу). У Вял. Айч. вайну нач. эвакашпіталя ў г. Арэнбург. З 1945 дырэктар Бел. НДІ туберкулёзу, адначасова ў Мінскім мед. ін-це (у 1948—57 заг. кафедры). Навук. працы па праблемных пытаннях туберкулёзу.

Тв.: Борьба с детским туберкулезом в БССР // Докл. Всебел. совещания педиатров. Мн., 1949.

ТАМА́САЎСКІ ПРАЦЭ́С, сталеплавільны працэс, разнавіднасць *канвертарнага працэсу*. Вынайдзены С.Дж.*Томасам* у 1878. Выкарыстоўваўся для перадзелу высокафосфарыстага (1,6—2% фосфару) вадкага чыгуну ў сталь прадзіманнем праз яго акісляльных газавых сумесей (сціснутага паветра, кісларoду, сумесі кісларoду з вугляkіслым газам і вадзяною параю і інш.). Прамысл. выкарыстанне пачалося з 1879 у Вялікабрытаніі, Германіі. Да сярэдзіны 1970-х г. у большасці краін выцеснены *кіслароднаканвертарным працэсам*.

ТАМА́Т, род кветкавых раслін, тое, што *памідор*.

ТАМАШО́Ў Даніла Парфіравіч (23.12.1875, в. Палошкава Клімавіцкага р-на Магілёўскай вобл. — 10.3.1926), майстар і рэстаўратар смычковых інструментаў. Вучыўся ў Кіеве (з 1892), працаваў пад кіраўніцтвам А.Дзідло (вучня Ж.Б.*Вільёма*, 1896). З 1901 самастойна вырабляў смычковыя інструменты ў Кіеве, з 1906 — у Вял. т-ры, кансерваторыі і інш. муз. установах Масквы. Інструменты, вырабленыя Т., адзначаны залатым медалём на выстаўцы ў Рыме (1911). Захаваліся 26 скрыпак, 3 віяланчэлі яго работы. Адзін з яго інструментаў зберагаецца ў калекцыі рэдкіх муз. інструментаў у Нац. музеі гісторыі і культуры Беларусі.

ТАМАШО́ЎКА, вёска ў Брэсцкім р-не, каля р. Зах. Буг, на аўтадарозе, якая злучае вёску з Брэстам. Цэнтр сельсавета. За 69 км на Пд ад Брэста, 1 км ад чыг. ст. Уладава. 1231 ж., 404 двары (2002). Санаторый «Елачка». Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, аптэка, аддз. сувязі. Свята-Пакроўская царква. Могілкі салдат 1-й сусв. вайны. Брацкая магіла сав. пагранічнікаў. Магіла ахвяр фашызму.

ТАМА́ШЧЫК Яўтен Аляксандравіч (н. 15.9.1933, в. Карпаўцы Бераставіцкага р-на Гродзенскай вобл.), бел. вучоны ў галіне хірургіі, рэфлексатэрапіі. Д-р мед. н. (1990), праф. (1991). Скончыў Казахскі мед. ін-т (г. Алма-Ата; 1960). З 1967 у Гродзенскім мед. ін-це (у 1990—98 заг. кафедры). Навук. працы па перадаперацыйнай падрыхтоўцы хворых на рак, язвавыя хваробы страўніка і дванаццаціперснай кішкі, па рэфлексатэрапіі ў лячэнні і рэабілітацыі хворых з розпаталогіяй.

Тв.: Иглорефлексотерапия в комплексной предоперационной подготовке // «Белорусско-польские дни хирургии»: Сб. материалов междунар. науч. симпозиума. Гродно, 2001.

ТАМАШЭ́ВІЧ Аляксандр Уладзіміравіч (13.8.1930, Мінск), бел. вучоны ў галіне эканомікі прыродакарыстання. Д-р эканам. н. (1985), праф. (1988). Сын У.А.*Тамашэвіча*. Скончыў БДУ (1954). З 1965 у Бел. н.-д. геолагаразведачным ін-це (з 1975 нам. дырэктара), з 1987 у БДУ (заг. кафедры). Навук. працы па эканам. геалогіі (эканоміцы мінер. сыравіны і геолагаразведачных работ) і эканам. геаграфіі.

Тв.: Экономическая оценка минеральных ресурсов Белоруссии. Мн., 1978; Новые тенденции в теории и практике экономики природопользования // Природные ресурсы. 1997. № 1; Минеральные ресурсы в хозяйственном комплексе Беларуси (разам з Я.А.Нікіціным, А.М.Сінічкам) // Вопросы минерагении платформенного чехла и кристаллического фундамента территории Беларуси. Мн., 2000; География мирового хозяйства: В 3 ч. Ч. 1. Мн., 2001.

ТАМАШЭ́ВІЧ Баляслаў Цітавіч (1863, в. Колунь Даўгаўпілскага р-на, Латвія — ?), графік. Творчасць звязана з маст. жыццём Расіі і Беларусі. Скончыў Пецярбургскую АМ (1886). У складзе археал. камісіі падарожнічаў па Беларусі і Украіне, рабіў замалёўкі нар. побыту і адзення беларусаў. Малюнкі і акварэлі Т. змяшчаліся ў час. «Нива», «Kraj» («Край»), альманаху «Z okolic Dźwiny» («З ваколіц Дзвіны»). Сярод твораў «Паляванне на качак», «Сустрэча», «На канікулах», «Беларуска ў нацыянальным касцюме». *Л.Н.Дробаў.*

ТАМАШЭ́ВІЧ Вікгар Мікалаевіч (н. 1.8.1954, Мінск), бел. вучоны-эканаміст і статыстык. Канд. эканам. н. (1986). Скончыў Бел. ін-т нар. гаспадаркі (1975). З 1975 у Цэнтр. стат. управленні пры СМ Беларусі. З 1979 у Бел. эканам. ун-це. З 1995 дырэктар НДІ статыстыкі Мін-ва статыстыкі і аналізу Рэспублікі Беларусь. Навук. працы па праблемах стат. вывучэння эканам. развіцця постсав. краін, мнагамернага стат. аналізу, параўнальнага аналізу макраэканам. сістэм.

Тв.: Оценка кредитоспособности предпринимателя. Мн., 1992 (у сааўт.); Статистика: нац. счета, показатели и методы анализа. Мн., 1995 (у сааўт.); Многомерный статистический анализ в экономике. М., 1999 (у сааўт.); Основы теории трансформаций общественных систем. Мн., 2000 (у сааўт.); Социально-экономические последствия двух российских революций // Бел. экон. журн. 2000. № 1.

ТАМАШЭ́ВІЧ Іван Мікалаевіч (н. 4.3.1949, в. Мерч Шклоўскага р-на Магілёўскай вобл.), бел. спявак (барытон), баяніст, педагог. Нар. арт. Беларусі (2000). Скончыў Мінскі пед. ін-т (1979). З 1969 працаваў ва ўстановах культуры Шклова і Бабруйска, з 1979 выкладчык Наваполацкага муз. і Полацкага пед. вучылішчаў. З 1988 арганізатар і маст. кіраўнік канцэртнага аб'яднання пры Бел. т-ве інвалідаў па зроку, з 2001 саліст Белдзяржфілармоніі. Адначасова з 1992 выкладчык Мінскага муз. вучылішча, з 1970 саліст сімф. аркестра і камерна-інстр. ансамбля Белтэлерадыёкампаніі, з 1992 — аркестра духавых інструментаў «Нямігa», з 1993 — Дзярж. аркестра сімф. і эстр. музыкі Беларусі пад кіраўніцтвам М.Фінберга. У рэпертуары песні замежных і бел. кампазітараў (некат. выконваў упершыню), рамансы, арыі з опер. Сярод канцэртных праграм: «О калі б мог выказаць у гуку» (1990), «Я не шкадую сэрца добрым людзям» (1995), «Раманс забыты, але цудоўны», «І адкрыліся вочы ў душы» (абодва 1996), «Жамчужны россып мелодый кахання» (1997), «Зямны паклон вялікім юбілярам» (1998—99, прысвечаны А.Пушкіну і П.Чайкоўскаму), «Букет прэм'ер ад юбіляра» (2000), «О раманс, ты любоў мая вечная» (2001). Лаўрэат Рэсп. (1989), Усесаюзнага і Міжнар. конкурсаў (абодва 1990) выканаўцаў камернай музыкі. *А.Л.Карацееў.*

ТАМАШЭ́ВІЧ Мікалай Мікалаевіч (13.5.1921, в. Новыя Валосавічы Лепельскага р-на Віцебскай вобл. — 23.9.1983), Герой Сав. Саюза (1944).

Скончыў Ленінградскую вышэйшую афіцэрскую бранятанк. школу (1945). У Чырв. Арміі з 1940. У Вял. Айч. вайну з 1941 на фронце, удзельнік баёў у Эстоніі, абароны Ленінграда, вызвалення Запаляр'я. Экіпаж танка на чале з мал. лейт. Т. вызначыўся ў студз. 1944 пры вызваленні Ленінградскай вобл.: прарваўся ў тыл ворага, нанёс праціўніку значныя страты і 3 дні ў акружэнні вёў бой да падыходу сав. пяхоты. Да 1956 у Сав. Арміі.

ТАМАШЭ́ВІЧ Уладзімір Антонавіч (22.2.1899, Мінск — 8.10.1983), партыйны дзеяч Беларусі, вучоны-эканаміст. Канд. эканам. н. (1953), праф. 1946). Бацька А.У. *Тамашэвіча*. Скончыў Камуністычны ун-т у Маскве (1924). У 1929—32 нам. рэктара Бел. камуніст. ун-та, потым выкладаў у Маскве. З 1944 сакратар Мінскага абкома КП(б)Б, з 1946 рэктар БДУ. У 1949—50 сакратар ЦК КП(б)Б. У 1944—65 па сумяшчальніцтве заг. кафедры палітэканоміі ў Мінскім пед. ін-це і БДУ. Навук. працы па эканам. гісторыі, праблемах індустрыялізацыі нар. гаспадаркі Беларусі.

Тв.: О некоторых вопросах экономики Белоруссии в дореволюционный период // Уч. зап. БГУ. Кафедра политэкономии. Мн., 1957. Вып. 1; Социалистическая индустриализация БССР в период первой пятилетки // Сб. статей по политэкономии. Мн., 1959; Народное хозяйство БССР (1920—1927 гг.) // Сб. по экономическим вопросам. Мн., 1961.

ТАМАШЭ́ЎСКІ Іван Герасімавіч (25.11.1918, в. Рудніца Сенненскага р-на Віцебскай вобл. — 12.12.1994), Герой Сав. Саюза (1944). Скончыў Мелітопальскае ваен. авіявучылішча штурманаў (1940), Вышэйшыя курсы ўдасканалення афіцэрскага .саставу (1945). У Чырв. Арміі з 1938. У Вял. Айч. вайну з 1941 на Зах., Паўд.-Зах., Сталінградскім; Паўд., 4-м Укр. франтах. Штурман звяна начных бамбардзіроўшчыкаў старшы лейт. Т. да 1944 зрабіў 581 баявы вылет на разведку, бамбардзіроўку і штурмоўку скопішчаў войск праціўніка. Да 1955 у Сав. Арміі.

ТАМБО́РА (Tambora), вулкан на в-ве Сумбава, у Інданезіі. Выш. 2820 м, дыяметр кальдэры 6 км, глыб. 600—700 м. У кальдэры — возера. Складзены пераважна з андэзітаў. У 1815 адбылося катастрафічнае выбухавае вывяржэнне (да яго выш. Т. дасягала 4000 м); цяпер у стадыі *сальфатары*.

ТАМБО́Ў, горад, цэнтр Тамбоўскай вобл. Расіі, прыстань на р. Цна (бас. р. Волга). Размешчаны ў цэнтр. ч. Окска-Данской (Тамбоўскай) раўніны. Засн. ў 1636. 312 тыс. ж. (2000). Вузел. чыгунак і аўтадарог. Аэрапорт. Прамысл. цэнтр з развітым хім. машынабудаваннем (з-ды «Тамбоўпалімермаш», «Тамбоўапарат», ВА «Гальванатэхніка»). Машынабуд. прадпрыемствы выпускаюць электратэхн. прадукцыю, камплектуючыя, запасныя трактарныя і аўтамаб. дэталі, кавальска-прэсавае абсталяванне. Развіты хім. (ВА «Пігмент» — вытв-сць анілінавых фарбавальнікаў, з-ды хім., азбеставых і гумавых тэхн. вырабаў), харч., лёгкая прам-сць. Вытв-сць буд. матэрыялаў. З ВНУ, у т.л. ун-т. Тэатры: драм., лялек. Філармонія. Карцінная галерэя. Краязн. музей. Арх. помнікі 18—19 ст.

ТАМБО́ЎСКАЯ ВО́БЛАСЦЬ. У цэнтры еўрап. ч. Рас. Федэрацыі. Утворана 27.9.1937. Пл. 34,3 тыс. км^2. Нас. 1257 тыс. чал. (2001), гарадскога 58%. Цэнтр — г. *Тамбоў*. Найб. гарады; Мічурынск, Расказава, Маршанск, Кірсанаў, Катоўск, Уварава.

Займае цэнтр. ч. Усх.-Еўрап. раўніны. У межах Окска-Данской раўніны (выш. да 219 м). Рэльеф пакатахвалісты, расчлянёны лагчынамі і ярамі. Карысныя выкапні: буд. матэрыялы, фасфарыты, торф. Крыніцы мінер. вод. Клімат умераны кантынентальны. Сярэдняя т-ра студз. -11 °С, ліп. 20 °С. Ападкаў каля 500 мм за год. Гал. рэкі: Цна з прытокамі (бас. р. Волга) і Варонеж, Варона, Матыра, Савала, Біцюг (бас. р. Дон). Глебы чарназёмныя, на Пн — шэрыя лясныя, па далінах і лагчынах — лугава-чарназёмныя і тарфяна-балотныя. Тэр. вобласці размешчана ў лесастэпавай зоне. Большая ч. стэпаў разарана, лясістасць менш за 10% (хвоя, дуб, клён, ліпа, ясень, бяроза, асіна). Варонінскі запаведнік.

Т.в. — індустр.-аграрны рэгіён Расіі. У структуры валавой прадукцыі на долю прам-сці і буд-ва прыпадае 31%, сельскай гаспадаркі — 17%, сферы паслуг — 52%. Вядучыя галіны прам-сці (паводле кошту прадукцыі, 2000): харчовая і харчасмакавая (цукровая, мясная, масласыраробная, агароднінакансервавая, піваварная, тытунёва-махорачная) — 26,9%, машынабудаванне і металаапрацоўка (вытв-сць абсталявання для хім., тэкст. прам-сці і чыг. транспарту, гальванатэхнікі, аўтапомпаў, авіяц. прылад, электратэхнікі, запчастак для аўтамабіляў і трактароў) — 27,9%, хім. і нафтахім. (вытв-сць азбеставых і гумава-тэхн, вырабаў, анілінавых фарбавальнікаў, мінер. угнаенняў, ферментаў, пластмас) — 18,3%. Электраэнергетыка грунтуецца на прывазным паліве. ЦЭЦ у гарадах Тамбоў, Катоўск, Мічурынск, Уварава. Развіта лёгкая (шарсцяная, трыкат., гарбарна-абуткавая, футравая), мукамольна-крупяная і камбікормавая, лясная, дрэваапр. і цэлюлозна-папяровая прам-сць. Вытв-сць буд. матэрыялаў. Сельская гаспадарка збожжа-жывёлагадоўчага кірунку. Пераважае прадукцыя раслінаводства (60%). С.-г. ўгоддзі займаюць 2,7 млн. га, у т.л. ворныя землі 2,1 млн. га (1999). Вырошчваюць збожжавыя (пшаніца, жыта, ячмень), тэхн. (цукр. буракі, сланечнік), бульбу, агародніна-бахчавыя і кармавыя культуры. Садоўніцтва (мічурынскія гатункі яблыкаў). Малочна-мясная жывёлагадоўля. Гадуюць буйн. раг. жывёлу, свіней, авечак, птушку. Даўж. чыгункі 736 км. Праз тэр. вобласці праходзіць чыгунка Саратаў—Масква. Гал. чыг. вузлы Тамбоў і Мічурынск. Працягласць аўтадарог з цвёрдым пакрыццём 5060 км. Суднаходства па р. Цна.

В.М.Сасноўскі.



ТАМЕРЛА́Н, мянушка *Цімура*, якая ўжываецца ў еўрапейскай гістарыяграфіі; скажонае ад Цімур-ленг (цюрк. — кульгавы Цімур).

ТАМЕРЛА́НАВЫ ВАРО́ТЫ, найбольш вузкая частка горнага праходу паміж паўн.-зах. часткай хр. Мальгузар і хр. Нуратау, у сістэме Гісара-Алая, ва Узбекістане. Шыр. 35—130 м. Праз Т.в. працякае р. Санзар (бас. Сырдар'і) і праходзіць чыгунка Ташкент — Самарканд. Назва звязана з *Тамерланам*, войскі якога, магчыма, праходзілі праз Т.в.

ТА́МЕРФОРС, шведская назва г. *Тампере* ў Фінляндыі.

ТАМІ́ЗМ (ад лац. Thomas Фама), кірунак ў *схаластыцы* і каталіцкай *тэалогіі*, які сфарміраваўся пад уплывам філасофіі *Фамы Аквінскага*. Характарызуецца імкненнем да рацыянальнага абгрунтавання хрысціянскага веравучэння, арыентаванасцю на філасофію Арыстоцеля ў большай ступені, чым на вучэнне Платона і неаплатонікаў. Гнасеалогія Т. заснавана на перакананні, што сэнс пазнанага шляхам божага ад-

крыцця павінен знаходзіцца ў згодзе з рацыянальным усведамленнем; у тэалогіі тамісты аддавалі перавагу касмалагічнаму доказу быцця Бога, а не анталагічнаму; антрапалогія Т. базіруецца на вучэнні пра адзінства душы і цела, якому душа надае «субстанцыянальную форму», этыка — на арыстоцелеўскай канцэпцыі дабрачыннасці як сярэдзіны паміж 2 заганамі. Першапачаткова Т. крытыкаваўся з боку прадстаўнікоў *аўгусцініянства*, якія ў пытаннях веры аддавалі перавагу інтуіцыі, і ў 1277 быў афіцыйна асуджаны ун-тамі Парыжа і Оксфарда. У 14 ст. Т. стаў агульнапрынятай дактрынай дамініканскага ордэна, якую абаранялі Гервей Наталіс, Іаан Капрэол у палеміцы з францысканскімі апанентамі. Пасля кананізацыі Фамы Аквінскага ў 1323 Т. замацаваўся ва ун-тах Парыжа і Кёльна. У 16 ст. Т. стаў пануючым вучэннем у каталіцкім багаслоўі (Ф.Суарэс). У 1879 энцыклікай папы Льва XIII Т. зацверджаны ў якасці каталіцкай дактрыны. Гл. таксама *Неатамізм*.

ТАМІЛНА́Д, штат на Пд Індыі, абмываецца Бенгальскім залівам. Пл. 130 тыс. км^2, Нас. каля 60 млн. чал. (2001), пераважна тамілы. Адм., прамысл. і культ. цэнтр, гал. порт — г. *Мадрас*. На ўзбярэжжы — алювіяльная раўніна, на З — частка *Дэканскага пласкагор'я*, асобныя горныя масівы. Клімат трапічны мусонны. Ападкаў 600—1200 мм за год, у гарах да 2500 мм. Лістападныя трапічныя лясы займаюць 10% тэр. З галін гаспадаркі пераважае земляробства. Гал. харч. культуры — рыс, пшаніца, кукуруза, прасяныя, бабовыя, агародніна; тэхн. — арахіс, бавоўнік, цукр. трыснёг, тытунь, каўчуканосы, кава, чай, спецыі, какосавая пальма. Гадуюць буйн. раг. жывёлу, авечак, коз. Рыбалоўства. Лесанарыхтоўкі. Саляны промысел (з марской вады). Здабыча лігнітаў, баксітаў, магнезіту. Прам-сць: тэкст., харчасмакавая, гарбарная, маш.-буд., чорная металургія, буд. матэрыялаў. Транспарт чыг., аўтамаб., марскі.

ТАМІЛО́ЎСКІ Георгій Сяргеевіч (3.7.1913, Мінск — 1.9.1990), Герой Сав. Саюза (1943). Скончыў Мінскае ваен. пях. вучылішча (1934), курсы «Выстрал» (1949), Вышэйшыя акад. курсы (1954). У Чырв. Арміі з 1931. У Вял. Айч. вайну з 1942 на Бранскім, Цэнтр., 1-м і 4-м Укр. франтах: камандзір палка, нам. і камандзір дывізіі. Полк на чале з палк. Т. вызначыўся ў ліп.—вер. 1943: у ліку першых фарсіраваў р. Дзясна, Прыпяць, Дняпро, вызваліў сотні нас. пунктаў, нанёс ворагу значныя страты ў баявой тэхніцы. Удзельнік *Парада Перамогі* ў Маскве. Да 1959 у Сав. Арміі, потым на выкладчыцкай рабоце.

ТАМІЛЬЧЫК Леў Мітрафанавіч (н. 1.4.1931, Мінск), бел. фізік-тэарэтык; пачынальнік даследаванняў па электрадынаміцы магн. зарадаў на Беларусі. Чл.-кар. Нац. АН Беларусі (1989), д-р фіз.-матэм. н. (1980), праф. (1985). Скончыў БДУ (1954). З 1957 і з 1970 у Ін-це фізікі Нац. АН (з 1987 заг. лабараторыі), у 1963—70 вучоны сакратар Аддз. фіз.-матэм. навук АН Беларусі. Навук. працы па крышталяоптыцы, электрадынаміцы, фізіцы элементарных часціц. Пабудаваў фенаменалагічную тэорыю аптычных уласцівасцей паглынальных магн. крышталёў. Распрацаваў сіметрыйныя і дынамічныя аспекты тэорыі магн. манаполя, арыгінальны геам. падыход да апісання сістэм моцна звязаных часціц. Абгрунтаваў праграму эксперым. пошуку магн. зараду. Аўтар прац па гісторыі і метадалогіі навукі.

Тв.: Электродинамика с магнитным зарядом. Мн., 1975 (разам з В.І.Стражавым); Описание составных систем в терминах неевклидова относительного пространства (разам з У.В.Кудрашовым, В.І.Мурзовым) // Проблемы физики высоких энергий и теории поля. М., 1988; Вальтер Ритц как физик-теоретик и его исследования по теории атомных спектров (разам з М.А.Ельяшэвічам, Н.Г.Кемброўскай) // Успехи физ. наук. 1995. Т. 165, №4.

Літ.: Л.М.Томильчик. Мн., 2001.

А.І.Болсун.

ТАМІ́Н Міхаіл Пятровіч (24.7.1883, в. Шаровічы Жыздрынскага р-на Калужскай вобл., Расія — 31.5.1967), бел. вучоны ў галіне батанікі. Акад. АН Беларусі (1956, чл.-кар. 1940), д-р біял. н. (1937), праф. (1929). Скончыў Маскоўскі с.-г. ін-т (1912). З 1913 у Варонежскім с.-г. ін-це, Архангельскім лесатэхн. ін-це, Арэнбургскім ін-це буйной мясной жывёлагадоўлі і ветэрынарыі. У 1934—41 і ў 1944—50 у Цэнтр. бат. садзе АН Беларусі, адначасова праф. БДУ, у 1950—61 заг. аддзела Ін-та біялогіі АН Беларусі. Навук. працы ў галіне ліхеналогіі, сістэматыкі ніжэйшых раслін, бат. геаграфіі. Яго імем названы 4 віды лішайнікаў.

Тв.: Определитель лишайников БССР. Ч. 1. Кустистые и листовые формы. Мн., 1936; Определитель лишайников БССР и смежных областей РСФСР и УССР. Ч. 2. Накипные формы. Мн., 1938; Лишайники, бактерии и актиномицеты. М., 1960 (разам з М.А.Камарніцкім, М.А.Красільнікавым).

Літ.: Горбач Н.В. Памяти М.П.Томина // Ботаника. Мн., 1969. Вып. 11.



Г.С.**Тамілоўскі**.



Л.М.**Тамільчык**.



М.П.**Тамін**.



Я.А.**Тамко**.

ТАМКО́ Ягор Андрэевіч (н. 3.8.1935, в. Лявонаўцы Міёрскага р-на Віцебскай вобл.), Герой Сав. Саюза (1978). Віцэ-адмірал (1988). Скончыў Вышэйшае ваен.-марское вучылішча імя М.В.Фрунзе (1958), Ваен.-марскую акадэмію імя М.Г.Кузняцова (1984). З 1958 служыў на Паўн. флоце. У 1977—84 камандзір дывізіі атамных ракетных падводных лодак. З 1984 нач. Вышэйшага ваен.-марскога вучылішча падводнага плавання імя Ленінскага камсамола. З 1992 старшы навук. супрацоўнік, дацэнт НДІ ВМФ Рас. Федэрацыі (С.-Пецярбург). Старшыня міжнар. фонду падводнікаў і ветэранаў падводнага флоту. Вызначыўся ў групавым плаванні падводных лодак пад ільдамі Арктыкі і пераходзе ў воды Ціхага акіяна. Удзельнік 14 далёкіх паходаў. Асвойваў новыя тыпы атамных падводных крэйсераў.

ТАМКО́Ў Леў Мікалаевіч (2.8.1937, г. Жлобін Гомельскай вобл. — 31.3.1997), бел. архітэктар. Засл. архітэктар Беларусі (1976). Скончыў БПІ (1960). З 1969



Л.**Тамкоў**, Л.Загрябаева. Помнік Смутку ў г. Хойнікі Гомельскай вобл.

гал. архітэктар ін-та «Гомельгрmaдзянпраект», з 1984 — Гомельскай вобл. Асн. работы: у Гомелі — праекты планіроўкі і забудовы мікрараёнаў і жылых раёнаў №1, Фестывальны і інш. (1960—70-я г., у сааўт.), рэстаран «Беларусь», аэравакзал (1969), Ін-т механікі металапалімерных сістэм АН Беларусі (1972), жылыя дамы па вуліцах Савецкай і Кожара (1979) і інш., мемар. комплекс на брацкіх магілах байцоў нар. апалчэння ў парку культуры і адпачынку імя Луначарскага (1975, у сааўт.); у г. Хойнікі — помнік Смутку да 10-годдзя катастрофы на Чарнобыльскай АЭС (1996), скульпт. Л.Заграбаева). Сярод інш. работ: мемар. дошкі акадэміку С.А.Чуніхіну (1995), псіхолагу Л.С.Выготскаму (1997, абедзве са скульпт. Дз.Паповым).

ТАМО́ЖНЯ, тое што *мытня*.

ТА́МПА (Tampa), горад на ПдУ ЗША, штат Фларыда. 289,2 тыс. ж., з г. Сент-Пітэрсберг і агульнымі прыгарадамі каля 2,2 млн. ж. (1998). Порт на беразе Мексіканскага зал. (грузаабарот каля 50 млн. т, вываз фасфарытаў, цытрусавых). Вузел чыгунак і аўтадарог. Міжнар. аэрапорт. Буйны прамысл. і гандл.-фін. цэнтр. Прам-сць: харчасмакавая, хім., паліграф., металургічная, металаапр., суднабуд., радыёэлектронная. 2 ун-ты. Клімат. курорт. Турызм. У наваколлі — здабыча фасфарытаў.

ТА́МПЕРЭ, Тамерфорс (фін. Tampere, швед. Tammerfors), горад на ПдЗ Фінляндыі, на пратоцы паміж азёрамі Нясіярві і Пюхяярві. Каля 190 тыс. ж. (2001). Вузел чыгунак і аўтадарог. Азёрны порт. Аэрапорт. Важны прамысл. цэнтр. Прам-сць: маш.-буд., тэкст., цэлюлозна-папяровая, харчовая. ГЭС. Ун-ты. Музеі: маст. гар., сучаснага мастацтва, маст. галерэя.

Упершыню згадваецца ў 1405 (шведская назва Тамерфорс). У 1779 атрымаў гар. права. У 1809 далучаны да Рас. імперыі. З 1821 меў права бяспошліннага ўвозу сыравіны і абсталявання. Да сярэдзіны 19 ст. стаў буйным тэкстыльным цэнтрам. У 1896 у Т. 278 прамысл. прадпрыемстваў.

Я.У.Новікаў (гісторыя).

ТАМПІ́КА (Tampico), горад на У Мексікі, штат Тамаўліпас, у вусці р. Панука. Каля 400 тыс. ж. (2001); утварае агламерацыю з г. Сьюдад-Мадэра. Порт на беразе Мексіканскага зал. (экспарт нафты і нафтапрадуктаў). Вузел чыгунак і аўтадарог, прадукта-, газа- і нафтаправодаў. Аэрапорт. Цэнтр буйнейшага ў краіне раёна здабычы і перапрацоўкі нафты. Прам-сць: хім., харчасмакавая, с.-г. машынабудаванне. Рыбалоўства.

ТАМПЛІЕ́РЫ (франц. templiers ад temple храм), х р а м о ў н і к і, ваенна-манаскі ордэн, заснаваны ў 1119 у Іерусаліме франц. рыцарамі. Назва ад месцазнаходжання першапачатковай рэзідэнцыі паблізу месца, дзе, паводле падання, знаходзіўся храм Саламона. Ордэн Т. засн. для абароны паломнікаў і заваяваных *крыжаносцамі* краін ад мусульман. Дзякуючы ахвяраванням вернікаў, занятку гандлем і ліхвярствам, ён ператварыўся ў буйнейшага феадала і банкіра Б. Усходу і Зах. Еўропы. У 13 ст. колькасць рыцараў дасягнула 15 тыс. Папства неаднаразова выкарыстоўвала Т. у барацьбе з ерасямі і нар. паўстаннямі. Пасля правалу крыжовых паходаў Т. асталяваліся ў Еўропе, пераважна ў Францыі. Франц. кароль Філіп IV Прыгожы баяўся росту магутнасці Т., імкнуўся завалодаць багаццем ордэна, таму ў 1307 дамогся арышту Т. і ўзбудзіў супраць іх інквізіцыйны працэс. У 1310 рыцары абвінавачаны ў *маніхействе* і на чале з магістрам спалены на агні, а маёмасць ордэна перайшла ў каралеўскую казну. У 1312 папа Клімент V скасаваў ордэн Т.

ТА́МСААРЭ (Tammsaare) Антон (сапр. Х а н з е н; 18.1.1878, хутар Тамсаарэ-Пых'я Ярваскага пав., Эстонія —1.3.1940), эстонскі пісьменнік. Вучыўся ў Тартускім ун-це (1907—11). Друкаваўся з 1901. У ранніх аповесцях «Дзве пары і адзінокі» (1902), «Старыя і маладыя» (1903), рамане «Гаспадар з Кырбоя» (1922) жыццё сялянства; у аповесцях «Маладыя душы» (1909), «Муха» (1917) і інш. побыт эст. інтэлігенцыі. Вяршыня яго творчасці — эпапея «Праўда і справядлівасць» (т. 1—5, 1926—33) пра гіст. лёс эст. народа з 1870-х да 1920-х г. Аўтар драмы «Юдзіф» (1921), алегарычнай п'есы-памфлета «Каралю холадна» (1936), філас.-сатыр. рамана «Новы Нячысцік з Пекла» (1939). Для яго твораў характэрна рэаліст. адлюстраванне сац. супярэчнасцей, нар. гумар, глыбокі псіхалагізм. На бел. мову асобныя творы Т. пераклалі А.Жук, А.Кудравец, М.Ракітны.

Тв.: Бел. пер. — Аповесці. Мн., 1980; Рус. пер. — Соч. Т. 1—6. М., 1966—68.

Літ.: С а й м и с к е р Х. Жизнь и творчество А.Х.Таммсааре. М., 1978.

І.У.Саламевіч.



Тамтам.

ТАМТА́М, т а м-т а м (тэрмін засн. на гукаперайманні, запазычаны ў Індыі), самагучальны ўдарны муз. інструмент; разнавіднасць гонга. З канца 18 ст. выкарыстоўваецца ў сімф. аркестры. Гукі нараджаюцца ад удараў калатушкамі з войлачным наканечнікам аб масіўны металічны дыск (дыяметр 600—1500 мм), падвешаны на рамцы.

ТАМУ́З, Д у м у з і, у міфалогіі і рэлігіі стараж. семіцкіх народаў бог урадлівасці, які штогод памірае і ўваскрасае. Паводле стараж. шумерскага міфа Т. — бог-пастух, каханы і муж багіні *Інаны*, якая аддала яго ў падземнае царства «як замену» сябе самой. Т. выратавала яго сястра Гештынана, якая пагадзілася праводзіць пад зямлёй замест брата палавіну кожнага года (у гэты час Т. апякае зямлю, якая квітнее і пладаносіць). У фінікійскай міфалогіі Т. адпавядае *Адоніс*.

ТАН, дынастыя імператараў Кітая ў 618—907. Засн. Лі Юанем, які пасля забойства ў 618 апошняга імператара з дынастыі *Суй* абвясціў сябе імператарам Гао-цзу [619—626]. Яго сын Лі Шымінь [Тайцзун; 626—649] да 628 канчаткова аб'яднаў Кітай, падавіўшы сял. паўстанні і мяцяжы сепаратыстаў. Пры першых імператарах Т. канчаткова склалася сістэма дзярж. экзаменаў (праіснавала да пач. 20 ст.), набыло развіццё сялянскае надзельнае землекарыстанне, паводле якога кожная сям'я атрымала вызначаны зямельны надзел. Да сярэдзіны 8 ст. танскія імператары ажыццяўлялі актыўную экспансіянісцкую палітыку; кіт. кантроль усталяваны на працягу ўсяго Вял. шаўковага шляху да Ферганскай даліны. Перыяд Т. адзначаны росквітам кіт. культуры, асабліва паэзіі (*Ду Фу, Лі Бо*). Але хуткі рост насельніцтва прывёў да недахопу ворнай зямлі, росту жабрацтва і вострага ўнутр. крызісу. У 751 танскія войскі разбіты арабамі пры Таласе. Моцна знясіліў дзяржаву мяцеж Ань Лушаня (755—763). Канчатковы ўдар імперыі Т. нанесла *Хуан Чао паўстанне 874—901*. У 907 апошні танскі імператар Лі Чжу скінуты военачальнікам Чжу Вэнем.

ТА́НА (Tana), О з а, рака ў Кеніі. Даўж. каля 800 км, пл. бас. 19 тыс. км^2. Пачынаецца ў гарах Абердэр, у верхнім цячэнні перасякае ўскраіну Усх.-Афрыканскага пласкагор'я, утварае парогі і вадаспады (Кора). Упадае ў Індыйскі ак., у вусці — пясчаны бар. Мнагаводная ў перыяд летніх дажджоў. Сярэдні расход вады каля 240 м^3/с. Суднаходная ў ніжнім цячэнні.

ТА́НА, Ц а н а, Д э м б е а, возера ў Эфіопіі, на Эфіопскім нагор'і. Размешчана на выш. 1830 м, у тэктанічнай катлавіне, падпруджана вулканічнай лавай. Пл. 3,1—3,6 тыс. км^2 (мяняецца па

сезонах года). Глыб. да 70 м. Шмат астравоў (найб. в-аў Дэк). Упадаюць шматлікія рэкі (найб. р. Малы Абай); выцякае р. Абай (Блакітны Ніл). Рыбалоўства. Суднаходства. Гал. прыстані — Гаргора, Бахр-Дар.



В.С.**Танаеў**.



І.У.**Тананаеў**.

ТАНА́ЕЎ Вячаслаў Сяргеевіч (28.3.1940, в. Акулава Бежацкага р-на Цвярской вобл., Расія — 19.7.2002), бел. вучоны ў галіне матэм. кібернетыкі і інфарматыкі. Акад. Нац. АН Беларусі (2000; чл.-кар. 1994), д-р фіз.-матэм. н. (1978), праф. (1980). Засл. дз. нав. Беларусі (1995). Скончыў Крымскі пед. ін-т (1962). З 1963 у Ін-це цепла- і масаабмену, з 1965 у Ін-це тэхн. кібернетыкі Нац. АН (з 1987 дырэктар). З 1996 ген. дырэктар НДА «Кібернетыка». Адначасова з 1979 праф. БДУ. Навук. працы па даследаванні аперацый, тэорыі прыняцця рашэнняў, мадэліраванні інтэлектуальных працэсаў, тэорыі і метадах аптымізацыі і іх выкарыстання ў аўтам. сістэмах праектавання, планавання і кіравання. Распрацаваў асновы агульнай тэорыі параметрычнай дэкампазіцыі экстрэмальных задач. Развіў тэорыю раскладаў («Тэорыя раскладаў. Аднастадыйныя сістэмы», 1984, з В.С.Гардонам, Я.М.Шафранскім; «Тэорыя раскладаў. Шматстадыйныя сістэмы», 1989, з Ю.Н.Сацковым, В.А.Струсевічам; абедзве перавыд. 1994 на англ. мове; «Тэорыя раскладаў. Групавыя тэхналогіі», 1998, з М.Я.Кавалёвым, Шафранскім), распрацаваў метады аптымізацыі дэтэрмінаваных абслуговых сістэм і рэжымаў іх функцыянавання. Дзярж. прэмія Беларусі 1998.

Тв.: Введение в теорию расписаний. М., 1975 (разам з В.В.Шкурбам); Декомпозиция и агрегирование в задачах математического программирования. Мн., 1987; Математические модели и методы календарного планирования. Мн., 1994 (разам з Ю.Н.Сацковым, В.А.Струсевічам). *М.П.Савік.*

ТАНА́Ж (франц. tonnage), паказчык перавозачнай здольнасці судна ці сукупнасці суднаў. Вызначаецца ў тонах поўнай грузападымальнасці (*дэдвейт*) ці ў *рэгістравых тонах* (грузаёмістасць).

ТА́НАІС, старажытнагрэчаская назва р. *Дон*, у вусці якога знаходзіўся аднайм. грэч. горад *Баспорскай дзяржавы*. З 7 ст. да н.э. Т. — гандл. шлях паміж аддаленымі раёнамі Скіфіі і грэч. гарадамі Прычарнамор'я. У старажытнасці Т. лічыўся мяжой паміж Еўропай і Азіяй, падзяляў тэрыторыі *скіфаў* і *сарматаў*. Паводле *Плутарха* больш стараж. назва Т. — «Амазонская рака», бо лічылася, што на яе берагах жылі *амазонкі*.

ТАНА́Й, возера ў Гарадоцкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Аўсянка, за 26 км на ПнУ ад г. Гарадок. Пл. 0,55 км^2, даўж. 950 м, найб. шыр. 800 м, найб. глыб. 2,7 м, даўж. берагавой лініі 3,1 км, пл. вадазбору 3,61 км^2. Катлавіна рэшткавага тыпу. Схілы выш. 5—10 м (на Пн і З невыразныя), пясчаныя, пад лесам. Пойма шыр. 100—300 м, забалочаная, пад хмызняком. Берагі сплавінныя на Пн і У участкамі тарфяністыя. Дно плоскае, сапрапелістае. Зарастае (пераважна падводнай расліннасцю). Выцякае р. Танайка.

ТАНА́КА Гііці (6.3.1863, г. Хагі, Японія — 29.9.1929), японскі ваенны і дзярж. дзеяч. Барон (1920). Генерал (1921). Вызначыўся ў час *руска-японскай вайны 1904—05*. У 1918—21 і 1923—24 ваенны міністр яп. ўрада. У 1927—29 прэм'ер-міністр Японіі. Лідэр партыі Сэюкай. Выступаў за больш жорсткую палітыку ў дачыненні да Кітая. З мэтай спыніць рух войск *Гаміньдана* на Пн Кітая у 1928 накіраваў яп. войскі ў кіт. прав. Шаньдун. Ва ўнутр. палітыцы кабінет Т. ажыццяўляў рэпрэсіі супраць левых арг-цый. З імем Т. звязана гісторыя з т.зв «мемарандумам Т.» — нібыта сакрэтнай знешнепаліт. праграмай яп. ўрада, тэкст якога быў распаўсюджаны ў 1929 кіт. і сусв. прэсай. Па сутнасці гэта і была праграма заваявання Японіяй сусв. панавання. Сапраўднасць «мемарандума Т.» не даказана, але яп. агрэсія ва Усх. і Паўд.-Усх. Азіі ў 1930 — пач. 1940-х г. развівалася ў поўнай адпаведнасці з гэтым дакументам.

ТАНА́КА (Tanaka) Каічы (н. 3.8.1959, г. Таяма, Японія), японскі інжынер-даследчык. Скончыў ун-т Тахоку ў г. Сендай (1983). З 1983 у карпарацыі «Шымадзу». Навук. працы па праблемах іанізацыі малекул і абсталявання для мас-спектраметрыі. Прапанаваў новую методыку выпарэння і іанізацыі асобных малекул шляхам кропкавага нагрэву бялковага рэчыва ці яго раствору лазернымі імпульсамі (у сааўт.; 1987). Распрацаваў метады мас-спектраметрыі для ідэнтыфікацыі і структурнага аналізу біял. макрамалекул ДНК і бялкоў. Нобелеўская прэмія 2002 (з К.Вютрыхам і Дж.Б.*Фенам*). *М.М.Касцюковіч.*

ТАНАКАТЭКУ́ТЛІ у міфах *ацтэкаў* вярхоўны бог. Т. разам са сваёй жонкай Танакасіўатль лічыліся творцамі сусвету, першай боскай і чалавечай парай, уладарамі самага верхняга (трынаццатага) неба.

ТАНА́ЛЬНАСЦЬ, 1) у мове вышыня галоснага гука, характэрная для яго параўнання з іншым. 2) У музыцы дакладнае вышыннае размяшчэнне гукаў *ладу*. Назва пэўнай Т. складаецца з абазначэнняў *тонікі* і ладу (ля мажор ці A-dur, скарочана A; фа-дыез мінор ці fis-moll: скарочана fis). У сучаснай гукавой сістэме тонікай можа служыць кожны з 12 гукаў *актавы*, адпаведна кожны лад можа быць рэалізаваны ў 12 Т.

ТА́НАНА (Tanana), рака на Алясцы, у ЗША, левы прыток р. Юкан. Даўж. 960 км, пл. бас. 115 тыс. км^2. Вытокі ў гарах Урангеля. У верхнім цячэнні парожыстая, ніжэй утварае шмат рукавоў і старыц. Ледастаў з кастр. да мая. Летняе разводдзе. Сярэдні расход вады 970 м^3/с. Суднаходная на 360 км ад вусця. На правым прытоку Т. (р. Чэна) — г. Фэрбанкс.

ТАНАНА́ЕЎ Іван Уладзіміравіч (4.6.1904, с. Сярповае Маршанскага р-на Тамбоўскай вобл., Расія — 28.2.1993), расійскі хімік. Акад. Рас. АН (1958, чл.-кар. 1946). Герой Сац. Працы (1984). Скончыў Кіеўскі політэхн. ін-т (1925), дзе і працаваў. З 1935 у Ін-це агульнай і неарган. хіміі АН СССР, адначасова ў 1939—68 выкладаў у маскоўскіх ВНУ (з 1940 праф.). У 1965—88 гал. рэдактар час. «Неорганические материалы». Навук. працы па неарган. і аналіт. хіміі, фіз.-хім. аналізе. Прапанаваў метад вывучэння гетэрагенных сістэм з малараствaральнымі кампанентамі (1967—69, метад астаткавых канцэнтрацый Т.). Распрацаваў метады атрымання звышчыстых крэмнію, германію, ферацыянідны метад атрымання рубідыю і цэзію з раствораў калійных солей. Дзярж. прэміі СССР 1949, 1951, 1971.

Тв.: Химия германия. М., 1967 (разам з М.Я.Шпіртам); Химия ферроцианидов. М., 1971 (у сааўт.); Особенности кристаллохимии соединений редкоземельных элементов. М., 1984 (разам з Г.А.Бандуркіным, Б.П.Джурынскім).

Літ.: И.В. Тананаев. М., 1979.

ТАНАНАРЫ́ВЕ (Tananarive), горад, сталіца Мадагаскара, гл. *Антананарыву*.

ТАНАТАЛО́ГІЯ (ад грэч. thanatos смерць + ...*логія*), раздзел медыцыны, які вывучае дынаміку і механізмы працэсу памірання, прычыны і прыкметы *смерці*. Развіваецца з 20 ст. Адрозніваюць агульную і спец. Т. (суд.-мед.). У шырокім сэнсе ахоплівае рэліг., філас., псіхал. аспекты смерці. Удасканальвае метадычныя прыёмы вызначэння стадый *тэрмінальнага стану* і часу надыходу клінічнай і біял. смерці.

ТАНАТАЦЭНО́З (ад грэч. thanatos смерць + ... *цэноз*), комплекс мёртвых жывёл, раслін або рэшткаў, што жылі на канкрэтным месцы ці прынесеныя вадой, ветрам з інш. месцаў. Узнікненню іх садзейнічала агульная прычына, напр., стыхійнае бедства (паводкі, лясныя пажары, смерчы і інш.). Ужываюць як сінонім некрацэнозу. З'яўляецца ас-

новай утварэння рэшткаў раслін, жывёл на пачатку стадыі пахавання (тафацэнозу). Можа разбурацца і знікаць пад уплывам *гіпергенезу*. Вывучае Т. *палеанталогія*.

ТА́НГА (ісп. tango), старадаўні іспанскі нар. танец, блізкі да цыганскіх танцаў т.зв. стылю фламенка. Муз. памер 2/4. Тэмп павольны. Мелодыя кубінскага паходжання. У 20 ст. ў зменены выглядзе атрымаў пашырэнне ў Амерыцы (пад назвай «аргенцінскае Т.») і Еўропе як салонны і эстр. парны танец. У яго харэаграфіі зліліся рысы ісп. і аргенцінскіх танцаў. Асн. рух (слізготны крок з раптоўнымі секунднымі прыпынкамі і рэзкай зменай становішча корпуса) свабодна вар'іруецца танцоўшчыкамі. На Беларусі Т. — папулярны бальны танец, уваходзіць у конкурсы па спарт. танцах, рэпертуар прафес. выканальніцкіх пар і самадз. студый бальнага танца.

Літ.: Вега К. Аргентинское танго: Пер. с исп. // Музыка стран Латинской Америки. М., 1983. *Ю.М.Чурко.*

ТА́НГА (Tanga), горад на ПнУ Танзаніі. Адм. цэнтр аднайм. вобласці. Каля 200 тыс. ж. (2001). Марскі порт, пач. пункт чыгункі і аўтадарог. Прам-сць: харчасмакавая, тэкст., металургічная, цэм., хім., дрэваапрацоўчая. Цэнтр асн. раёна ў краіне па вырошчванні сізалю і арахісу.

ТАНГА́Ж (франц. tangage кілевая гайданка), вуглавы рух судна (або лятальнага апарата), пры якім яго падоўжная вось змяняе свой напрамак адносна гарыз. плоскасці. Характарызуецца вуглом і скорасцю.

ТАНГАНЬІ́КА (Tanganyika), возера ў Афрыцы, у Дэмакр. Рэспубліцы Конга, Танзаніі, Замбіі і Бурундзі. Пл. 34 тыс. км^2. Размешчана ў тэктанічнай упадзіне Усх.-Афрыканскай зоны разломаў на выш. 773 м. Даўж. каля 650 км, шыр. да 80 км, глыб. да 1470 м (другое па глыбіні пасля воз. Байкал). Берагі прамалінейныя, месцамі высокія і стромкія. У Т. ўпадаюць рэкі Малагарасі і Рузізі. Сцёк па р. Лукуга ў р. Луалаба (бас. р. Конга). Багатая фауна; сярод рыб, крэветак, весланогіх і інш. вял. колькасць эндэмікаў. Водзяцца бегемоты, кракадзілы, шмат вадаплаўных птушак. Па берагах — нац. паркі: Сумбу (Замбія), Гомбе-Стрым (Танзанія); рэзерват Убвары (Дэмакр. Рэспубліка Конга). Рыбалоўства. Суднаходства. Парты: Кігома (Танзанія), Бужумбура (Бурундзі), Калеміе (Дэмакр. Рэспубліка Конга). Адкрыта англ. даследчыкамі Р.Бёртанам і Дж.Спікам у 1858.

ТАНГАНЬІ́КА (Tanganyika) у 1920—47 падмандатная, у 1947—61 падапечная тэр. Вялікабрытаніі ва Усх. Афрыцы. З 1961 незалежная дзяржава, у выніку аб'яднання Т. і Занзібара ў 1964 створана *Танзанія*.

ТАНГАРЫ́РА (Tongariro), нацыянальны парк у Новай Зеландыі, на вулканічным плато ў цэнтр. ч. в-ва Паўночны. Пл. 76,2 тыс. га. Створаны ў 1894. Горны раён (выш. 600—2979 м) з дзеючымі (Нгаўрухоэ, Руапеху, Тангарыра) і патухлымі вулканамі. Гарачыя азёры. Тэрмальныя крыніцы. Мяшаныя субтрапічныя лясы з эпіфітамі да выш. 850 м, вышэй (да 1600 м) лясы з серабрыстага і горнага букаў. На мяжы лесу — пояс хмызняку, пераважна са складанакветных і папарацей, участкамі злакоўнікі (тасек). У батанічным садзе Т. каля 450 відаў абарыгенных раслін. На Т. вял. колькасць абарыгенных птушак: белавочка, валасянкавыя, медасос, веерахвостка, мухалоўка, папугаі, у т.л. чырваналобы і зялёны нестар, новазеландскі сокал, паўночны ківі, пастушок уэка, лунь і інш. Сярод уселеных жывёл — высакародны алень, тары, серна, апосумы, зайцы, здзічэлыя каты і свінні; з птушак — зяблік, чорны дрозд, фазаны, курапаткі, вераб'і. Экзатычныя віды кустоў і траў. Турызм. Т. ўключаны ЮНЕСКА у спіс *Сусветнай спадчыны* (1990).

ТАНГАТА́ПУ (Tongatapu), Тангатабу, каралавы востраў у Ціхім ак., найб. ў архіпелагу Тонга, у складзе дзяржавы *Тонга*. Пл. 257 км^2. Нас. каля 50 тыс. чал. (2000). Выш. да 61 м. Клімат трапічны пасатны. Плантацыі какосавых пальмаў, бананаў, цытрусавых. На Т. — г. Нукуалофа — сталіца і гал. порт краіны.

ТАНГЭ

руху матэрыяльнага пункта $a_\tau < 0$, пры паскораным — $a_\tau > 0$, пры раўнамерным руху — $a_\tau = 0$.

ТАНГЛА́, горны хрыбет у Кітаі, на Тыбецкім нагор'і. Даўж. каля 700 км. Выш. да 6096 м (г. Басудан-Ула). Складаецца з некалькіх горных масіваў, утвораных пераважна з вапняковых і гліністых сланцаў. Вяршыні купалападобныя, схілы пакатыя. Высакагорныя стэпы, галечныя і друзавыя халодныя пустыні. Ледавікі.

ТАНГУ́Н, паводле карэйскіх легенд і летапісных паданняў, родапачынальнік карэйцаў, заснавальнік карэйскай дзяржавы Часон. Сярод міфаў пра Т. найб. пашырана версія з твора 13 ст. «Самгук юса», паводле якой, Т. — сын небажыхара Хвануна і мядзведзіцы, што ператварылася ў прыгожую жанчыну. Легендарная дата пачатку праўлення Т. (2333 да н.э.) прынята ў Рэспубліцы Карэя як адлік «нацыянальнай» эры летазлічэння. У 1993 у Карэйскай Нар. Дэмакр. Рэспубліцы абвешчана, што грабніца з рэшткамі Т. знойдзена каля Пхеньяна, т.ч. Т. — рэальная гіст. асоба. 11.10.1994 урачыста адкрыта новая велічная мармуровая грабніца Т. ў выглядзе піраміды памерамі 45 × 45 × 22 м.

Літ.: Корейские предания и легенды из средневековых книг. М., 1980; Чан У Чжин. Антропологические особенности костей человека, обнаруженных в гробнице Тангуна // Корея сегодня. 1994. №1; Реконструированная гробница Тангуна // Корея. 1994. №11. *Ю.В.Бажэнаў.*



Грабніца **Тангуна**. Павет Кандон каля Пхеньяна. 1994.

ТА́НГЕНС (ад лац. tangens які датыкаецца), адна з *трыганаметрычных функцый*. Абазначаецца tg. Т. вострага вугла прамавугольнага трохвугольніка — адносіны катэта, што ляжыць насупраць гэтага вугла, да катэта, які прылягае да яго.

ТАНГЕНЦЫЯЛЬНАЕ ПАСКАРЭ́ННЕ, датычнае паскарэнне, складальная *паскарэння* матэрыяльнага пункта пры яго нераўнамерным крывалінейным *руху*, накіраваная ўздоўж датычнай да яго траекторыі. Пры прамалінейным руху супадае з поўным паскарэннем. Характарызуе хуткасць змены модуля скорасці: $\vec{a}_\tau = (dv/dt)\vec{\tau}$, дзе $\vec{\tau} = \vec{v}/v$ — адзінкавы вектар датычнай. Праекцыя Т.п. на напрамак скорасці $a_\tau = dv/dt$. Пры запаволеным

вым дынамічна-функцыян. гар. асяроддзем. Яна апіраецца на традыцыі яп. архітэктуры, але па-наватарску сінтэзуе іх для сучасных функцый, выкарыстоўвае новыя буд. матэрыялы, жал.-бетонныя канструкцыі, арх. структуры бетонных шахтаў з інж. камунікацыямі. Асн. работы (у сааўт.): у Токіо — Цэнтр мастацтваў Сагэцу (1956), будынак мультыцыі пра Польшчу» (перавыдадзена некалькі разоў на розных мовах). Звесткі пра Беларусь у ёй пададзены з пункту гледжання падарожніка. Так, Т. раіў падарожнікам, якія будуць наведваць гэтую краіну, браць з сабой харчовыя прадукты, віно, міску, лыжку і нож, бо падарожнікам часта давядзецца начаваць пад павеццю, побач з коньмі, каровай і бочкамі з капустай.

Літ.: Грыцкевіч В., Мальдзіс А. Шляхі вялі праз Беларусь. Мн., 1980.

А.П.Грыцкевіч.



К.**Тангэ**.



С.І.**Танееў**.

ніцыпалітэта (1952—57), Алімп. спарт. комплекс (1961—64), кафедральны сабор св. Марыі (1963—64); цэнтры Міру ў г. Хірасіма (1949—56), масавай інфармацыі ў г. Кофу (1962—67) і інш. Аўтар плана-праекта рэарганізацыі і пашырэння Токіо (1960), праектаў Сусв. выстаўкі «ЭКСПО-70» у г. Осака (1967), рэканструкцыі г. Скоп'е (1965).

Тв.: Рус. пер. — Архитектура Японии. М., 1976.

Літ.: Кендзо Танге: Архитектура и градостроительство. М., 1978.

Я.Ф.Шунейка.



К.**Тангэ**. Цэнтр масавай інфармацыі ў г. Кофу.

ТАНД (Tende) Гаспар дэ (1618, г. Ман, Францыя — 1697), французскі падарожнік і пісьменнік. Служыў пры двары польскага караля і вял. кн. ВКЛ Яна II Казіміра Вазы. Пасля адрачэння караля ад трона ў 1668 вярнуўся ў Францыю. У 1674 зноў ездзіў у Рэч Паспалітую ў якасці сакратара франц. пасла. У 1684 выдаў у Парыжы кн. «Гістарычныя рэ-

ТАНДРАКІ́ЙЦЫ, тандракіты, удзельнікі ераты чнага нар. руху ў Арменіі ў сярэдзіне 9—11 ст. з цэнтрам у с. Тандрак (на Пн ад воз. Ван). Т. адмаўлялі царк. абрады і заклікалі да скасавання афіц. царквы. Вял. ўплыў на ідэалогію Т. зрабілі паўлікіяне з іх ідэямі дуалізму дабра і зла. Найб. радыкальная плынь Т. прапаведавала бязбожнасць і адмаўляла ідэю бессмяротнасці душы. Рух Т. ахапіў раёны Айрарата, Шырака, Сюніка і падуладныя Візант. імперыі раёны Тарон, Харк і Мананалі. Да 970-х г. рух Т. задушаны ў візант. уладаннях, да сярэдзіны 11 ст. — на астатняй тэр. Арменіі.

ТАНДЭ́М (англ. tandem), 1) парадак размяшчэння аднародных машын або іх частак у агрэгаце на адной восі, лініі. 2) Паравая машына з падобным размяшчэннем рабочых цыліндраў. 3) Двухмесны двухколавы веласіпед з падвойнай зблакіраванай перадачай.

ТАНЕГА́ВА (Tonegawa) Сусуму (н. 6.9.1939, г. Нагоя, Японія), японскі вучоны ў галіне генетыкі. Праф. (1981). Скончыў ун-т г. Кіёта (1963). З 1963 ва ун-це Каліфорніі г. Сан-Дыега (ЗША), з 1971 у Ін-це імуналогіі г. Базель (Швейцарыя), з 1981 у Цэнтры па вывучэнні рака Масачусецкага тэхнал. ін-та г. Кеймбрыдж (ЗША). Навук. працы ў галіне імунагенетыкі, выявіў будову рэцэптараў Т-лімфацытаў, перарывістую будову генаў імунаглабулінаў. Нобелеўская прэмія 1987.

ТАНЕ́ЕЎ Сяргей Іванавіч (25.11.1856, г. Уладзімір, Расія — 19.6.1915), рускі кампазітар, піяніст, муз. тэарэтык, педагог, грамадскі дзеяч. Скончыў Маскоўскую кансерваторыю (1875, кл. М.Рубінштэйна і П.Чайкоўскага), з 1878 выкладаў у ёй (з 1881 праф., у 1885—89 дырэктар). Адзін з заснавальнікаў Нар. кансерваторыі (1906) і Муз. навук. т-ва (з 1908 Муз.-тэарэт. б-ка). Чл. *Музычна-этнаграфічнай камісіі*. Першы выканаўца многіх фп. твораў Чайкоўскага. Творам Т. ўласцівы актыўны валявы характар, строгая лагічнасць формы, філас.-этычная накіраванасць зместу, дасканалае поліфанічнае майстэрства, спалучэнне глыбіні думкі і лірычнай выразнасці. Найб. значныя творы: опера-трылогія «Арэстэя» (паст. 1895), кантаты «Іаан Дамаскін» (1884) і «Пасля чытання псалма» (1915), сімфонія до мінор (4-я, 1898), 2 стр. квінтэты, фп. квінтэт, 4-ы і 6-ы квартэты, Канцэртная сюіта для скрыпкі з арк., хоры без суправаджэння. Апрацоўваў нар. песні, у т.л. 2 бел. вяснянкі. У Дзярж. т-ры оперы і балета Беларусі паст. яго опера «Арэстэя» (1963). Аўтар прац «Вучэнне пра канон» (выд. 1929), «Рухомы кантрапункт строгага пісьма» (2-е выд., 1959). Сярод вучняў: Р.Гліэр, К.Ігумнаў, Г.Канюс, С.Ляпуноў, М.Метнер, З.Паліяшвілі, С.Рахманінаў, А.Скрабін і інш.

Літ. тв.: Дневники. Кн. 1—3. М., 1981—85.

Літ.: Бажанов Н. Танеев М., 1971; Бернандт Г.Б. С.И.Танеев. 2 изд. М., 1983.

Т.Г.Слабодчыкава.

ТАНЕ́ЖЫЦЫ, вёска ў Рачкавіцкім с/с Слуцкага р-на Мінскай вобл. Цэнтр эксперым. базы «Танежыцы». За 23 км на ПдЗ ад горада і чыг. ст. Слуцк, 128 км ад Мінска. 706 ж., 278 двароў (2002). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ТА́НЕР (Tanner) Бернгард Леапольд Францішак, чэшскі падарожнік 2-й пал. 17 ст., езуіт. У 1676 прыехаў з Прагі на службу да валынскага ваяводы М.Е.Чартарыйскага. Разам з ім у 1678 удзельнічаў у пасольстве ў Маскву. Вёў запісы падарожжа, апісаў бел. землі, дарогі, гарады (Брэст, Нясвіж, Мінск, Барысаў, Оршу і інш.). Запісы выдадзены ў Нюрнбергу ў 1689.

Тв.: Рус. пер. — Описание путешествия польского посольства в Москву в 1678 г. // Чтения в О-ве истории и древностей российских. 1891. Кн. 3.

ТА́НЕЦ (польск. taniec ад ням. Tanz), від мастацтва, у якім асн. сродкі стварэння маст. вобраза — гарманічныя рухі і змены пастаў цела танцоўшчыка. Дадатковыя сродкі выразнасці (міміка і *пантаміма*) канкрэтызуюцца і ўзбагачаюцца касцюмам, аксесуарамі, рэквізітам і разам з асн. складаюць адзіную маст. сістэму. Мастацтва Т. служыць сродкам эмац. ўздзеяння.

Т. — адзін з найб. стараж. відаў нар. творчасці. Узнік пад уплывам эмац. ўражанняў ад навакольнага асяроддзя, разнастайных жэстаў і рухаў, звязаных з прац. працэсамі, імітацыяй пластыкі жывёл. Як істотная частка нар. творчасці напачатку выступаў у сінкрэтычным адзінстве са словам, напевам, музыкай, пазней ператварыўся ў самаст. мастацтва. Адзін з арганізуючых пачаткаў Т. *рытм* (суправаджаецца ўдарнымі інструментамі, кастаньетамі, воплескамі, выстукваннямі абцасамі і інш.). У кожнага народа склаўся свой нац. стыль Т. са сваімі выканальніцкімі традыцыямі, танц. мовай і кампазіцыйнымі малюнкамі, прыёмамі суадносін з музыкай. На гэтай аснове сталі фарміравацца *бытавы танец* (нар. і бальны) і сцэнічны Т. (гл. *Балет*). У прафес. мастацтве склаліся танц. сістэмы ў Еўропе (еўрап. класічны Т.), краінах Азіі і Афрыкі. Франц. Акадэмія танца (1661) вызначыла асн. правілы класічнага Т. (дакладныя пазіцыі ног і рук, пералік гал. пастаў і г.д.), што паспрыяла развіццю балета; склалася яго разнавіднасць — характарны Т. У канцы 19 ст. ўзнік кірунак — т.зв. *танец мадэрн*. У наш час развіваюцца і інш. віды сцэн. Т.: эстрадны (яго характарызуе лаканізм выразных сродкаў і віртуознасць тэхнікі), джазавы, Т. буто і інш.

Вытокі бел. танц. мастацтва — у культуры ўсх.-слав. плямён. Пад уплывам розных фактараў у нар. Т. беларусаў склаўся асобы стыль выканання з наборам гал. сродкаў выразнасці. Побач з *народным танцам* і пад яго ўплывам развіваліся (у творчасці скамарохаў) пачатковыя формы прафес. сцэн. Т. Прысутнічалі яны ў паказах *школьнага тэатра, народнай драмы*. Упершыню бел. нар. Т. выкарыстаны ў оперы «Ідылія» («Сялянка») С.Манюшкі на лібрэта В.Дуніна-Марцінкевіча ў 1852. У пач. 20 ст. ў блізкім да этнагр. выглядзе выконваліся Т. трупай І.Буйніцкага. Пазней створаны прафес. калектывы: *Ансамбль беларускай народнай песні і танца Беларускай філармоніі* (1937—41), Бел. ансамбль песні і танца (1940, з 1950 Дзярж. хор Беларусі). На 2002 на Беларусі працуюць: *Ансамбль песні і танца Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўны ансамбль танца Рэспублікі Беларусь*, танц. група *Дзяржаўнага акадэмічнага народнага хору Рэспублікі Беларусь*, Бел. фальклорна-харэагр. ансамбль «*Харошкі*», Бел. дзярж. ансамбль харэагр. і муз. мініяцюр «Бліскавіца», балетная трупа Бел. муз. т-ра і інш., а таксама шматлікія аматарскія танц. калектывы (гл. *Самадзейнае харэаграфічнае мастацтва*). Прафес. кадры танцоўшчыкаў рыхтуюць (2002): Бел. дзярж. харэагр. каледж, харэагр. аддз. Віцебскага, Гродзенскага, Мінскага, Пінскага вучылішчаў мастацтваў, Магілёўскае вучылішча культуры, Гомельскі каледж мастацтваў.

Літ.: Лопухов А.В., Ширяев А.В., Бочаров А.И. Основы характерного танца. Л.; М., 1939; Ваганова А.Я. Основы классического танца. 4 изд. Л.; М., 1963; Голейзовский К. Образы русской народной хореографии. М., 1964; Ткаченко Т.С. Народный танец. М., 1967; Добровольская Г. Танец. Пантомима. Балет. Л., 1975; Алексютович Л.К. Белорусские народные танцы, хороводы, игры. Мн., 1978; Васильева-Рождественская М.В. Историко-бытовой танец. 2 изд. М., 1987; Чурко Ю.М. Белорусский сценический танец. Мн., 1969; Яе ж. Белорусский хореографический фольклор. Мн., 1990.

С.В.Гуткоўская.

ТА́НЕЦ МАДЭ́РН. Склаўся на мяжы 19—20 ст. у ЗША і Германіі як адзін з кірункаў сучаснай *харэаграфіі*. Тэрмін «Т.м.» выцесніў назвы «вольны танец», «дунканізм», «танец басаножак», «рытмапластычны танец», «экспрэсіянісцкі», «новы маст. танец» і інш. Заснавальніца Т.м. — амер. танцоўшчыца А.*Дункан* (імітацыя ант. форм танца, «танец басаножак», адмаўленне ад традыц. балетнага касцюма, зварот да сімф. і камернай музыкі). Асн. прынцыпы Т.м.: увасабленне новых тэм і сюжэтаў, пошук арыгінальных выразных танц.-пластычных сродкаў, высокая ступень імправізацыі, сінтэз розных стыляў, акцэнт на індывід. вынаходлівасць харэографа. Для яго развіцця характэрны імкненне да эксперыментавання, стварэння новых стылявых канцэпцый як процістаянне традыц. балетным формам. Фарміраванне Т.м. звязана з тэарэт. працамі Ф.*Дэльсарта*, Р. фон *Лабана*, практыкамі М.Вігман, М.Грэхем, Э.*Жакам-Далькрозам*, К.Іосам, Р.Сен-Дэні і інш. Т.м. паступова сінтэзаваўся з класічным танцам, што найб., ярка выявілася ў творчасці балетмайстраў К.Галяйзоўскага, С.Ліфара, В.Ніжынскага, М.Фокіна, Л.Якабсона, пазней — у творчасці Дж.Баланчына, М.Бежара, Ю.Грыгаровіча, Р.Пці. У розных краінах свету сфарміраваліся і развіваюцца розныя школы і плыні. Значную ролю ў папулярызацыі і станаўленні Т.м. на Беларусі адыгрывае штогодні Міжнар. фестываль сучаснай харэаграфіі ў Віцебску (з 1992). На бел. балетнай сцэне элементы Т.м. відавочны ў паст. А.Дадышкіліяні, В.Елізар'ева, Р.Паклітару і інш.

С.В.Гуткоўская.

ТАНЖЭ́Р (араб. Танджа, стараж.-рым. Тынгіс), горад на Пн Марока. Адм. ц. аднайм. правінцыі. Засн. ў канцы 2-га тыс. да н.э. фінікійцамі, у 1912—56 — міжнар. зона, у 1957 уз'яднаны з Марока. Каля 300 тыс. ж. (2001). Порт у Гібралтарскім праліве (вываз цытрусавых, рыбных і фруктовых кансерваў). Буйнейшы пасажырскі порт Марока. Вузел аўтадарог. Міжнар. аэрапорт. Гандл.-трансп. і транзітны цэнтр паўн. ч. краіны. Прам-сць: харч., тэкст., цэментная. Абарончыя збудаванні і Вялікая мячэць (17 ст.), палац Дар-аль-Махзен (18 ст.). Музеі. Турыст. цэнтр.

ТАНЗА́НІЯ (Tanzania), Аб'яднаная Рэспубліка Танзанія (суахілі Jamhuri ya Muungano wa Tanzania, англ. United Republic of Tanzania), дзяржава ва Усх. Афрыцы. Складаецца з мацерыковай (Танганьіка) і астраўной (а-вы Занзібар і Пемба) частак. Мяжуе на Пн з Кеніяй і Угандай (частка граніцы па воз. Вікторыя), на З з Руандай, Бурундзі, Дэмакр. Рэспублікай Конга (граніца па воз. Танганьіка), Замбіяй, Малаві (частка граніцы па воз. Ньяса), на Пд з Мазамбікам; на У абмываецца Індыйскім ак. Пл. 945,09 тыс. км². Нас. 35 306,1 тыс. чал. (2000). Дзярж. мова — суахілі і англійская. Сталіца — г. *Дадома* (урадавыя ўстановы паступова пераводзяцца з г. *Дар-эс-Салам*). Краіна падзяляецца на 25 абласцей (20 на мацерыку, 5 у астраўной частцы). Нац. свята — Дзень Саюза (26 крас.).



Герб і сцяг **Танзаніі**.



Дзяржаўны лад. Т. — рэспубліка. Дзейнічае канстытуцыя 1977. Кіраўнік дзяржавы і ўрада — прэзідэнт, які выбіраецца на ўсеагульных выбарах на 5 гадоў. Вышэйшы заканад. орган — парламент, у які ўваходзяць прэзідэнт краіны і Нац. асамблея з 232 дэпутатаў, што выбіраюцца кожныя 5 гадоў на ўсеагульных выбарах прамым і тайным галасаваннем (частка дэпутатаў назначаецца).

Прырода. Большая ч. тэр. — на Усх.-Афр. пласкагор'і (на выш. больш за 1000 м). Характэрны ланцугі пласкаверхіх узвышшаў і гор. Уздоўж зах. і паўд.-зах. граніц працягнуліся скідавыя ўпадзіны Усх.-Афр. высокасейсмічнай зоны разломаў з вулканамі *Кіліманджара* (выш. 5895 м, найвыш. пункт Афрыкі) і *Меру* (4567 м). Уздоўж узбярэжжа Індыйскага ак. — вузкая нізіна. Карысныя выкапні: алмазы, волава, вальфрам, фасфарыты, тытана-магнетытавыя, ніобіевыя руды і інш. Клімат экватарыяльны мусонны. Сярэднямесячныя т-ры ад 15—20 °С да 25—27 °С. Ападкаў на б.ч. краіны 500—1500 мм за год. Гал. рэкі Пангані, Руфуджы, Рувума ўпадаюць у Індыйскі акіян. Т. часткова належаць азёры Вікторыя, Танганьіка, Ньяса; ёсць бяссцёкавыя салёныя азёры Руква, Натран, Эясі. У натуральнай расліннасці на З і Пд пераважаюць трапічныя сухія рэдкалессі, на прыморскай нізіне — паркавыя саванны, у цэнтр. і паўн.-ўсх. раёнах — травяністыя саванны. Па схілах гор — вечназялёныя лясы, хмызнякі. Шматлікія нац. паркі і рэзерваты, у т.л. Селус, Серэнгеці, Кіліманджара і Нгарангора, якія ўключаны ЮНЕСКА у спіс *Сусветнай спадчыны*, а таксама Руаха, Мікумі, Тарангірэ, Рунгва, створаныя для аховы багатай фауны млекакормячых (сланы, насарогі, бегемоты, буйвалы, зебры, жырафы і інш.).

Насельніцтва. Т. — шматнацыянальная краіна, больш за 30 народаў. Каля 98% складаюць афр. народы, што пераважна належаць да ўсх. банту. Найб. народы: ньямвезі, сукума, суахілі, хехе, бена, макондэ, хайя, кінга, джага. На ПнУ жывуць масаі, мова якіх адносіцца да нілоцкай сям'і, у цэнтр. частцы — народы, што гавораць на кушыцкіх і кайсанскіх мовах. Ёсць таксама індыйцы, пакістанцы, арабы. Сярод вернікаў хрысціяне (45%), мусульмане (35%), прыхільнікі традыц. вераванняў (20%). Сярэднегадавы прырост 2,57% (2000). Сярэдняя шчыльн. 37,4 чал. на 1 км^2. Найб. населены раён на Пд ад воз. Вікторыя, схілы Кіліманджара і Меру, в-аў Занзібар (да 500 чал. на 1 км^2), найменш — унутр. пласкагор'і. У гарадах жыве 31% насельніцтва (1998). Найб. гарады (2000, тыс. ж.): Дар-эс-Салам — 1360,8, Мванза — каля 300, Дадома, Танга і Занзібар — каля 200. У сельскай гаспадарцы занята 80% эканамічна актыўнага насельніцтва.

Гісторыя. На тэр. Т. знойдзены найб. стараж. рэшткі чалавека (гл. *Олдувай*). Аўтахтоннае насельніцтва Т. — плямёны, блізкія да сучасных *бушменаў* і гатэнтотаў. У 1-м тыс. н.э. тут пасяліліся плямёны земляробаў банту і жывёлаводаў нілотаў. У 7—8 ст. сюды праніклі арабы; у выніку іх узаемадзеяння з мясц. насельніцтвам ва ўзбярэжных раёнах Т. склалася мусульм. паводле веравызнання этн. супольнасць — суахілі. Існаваў шэраг гарадоў-дзяржаў суахілі, багацце якіх ствараў транзітны гандаль паміж унутр. раёнамі Афрыкі і краінамі Б. Усходу. У канцы 15 ст. тут з'явіліся партугальцы, якія ўсталявалі кантроль над гарадамі суахілі. У канцы 17 ст. партугальцаў выгналі аманцы. У 1856 узнік самастойны султанат Занзібар з цэнтрам на аднайм. востраве на чале з дынастыяй аманскага паходжання. У 1884 над мацерыковай ч. Т. ўстанавіла кантроль Германія. А-вы Занзібар з 1890 сталі брыт. пратэктаратам. У 1-ю сусв. вайну Герм. Усх. Афрыку акупіравалі брыт. войскі; у 1920 б.ч. яе пад назвай Танганьіка перададзена Лігай Нацый пад кіраванне Вялікабрытаніі. У 2-ю сусв. вайну больш за 80 тыс. выхадцаў з Т. змагаліся ў складзе брыт. арміі. У 1954 створаны Нац. афр. саюз Танганьікі (ТАНУ) на чале з Дж.К.*Ньерэрэ*. ТАНУ перамог на ўсеагульных выбарах 1960 і ўзначаліў урад Танганьікі. 9.12.1961 абвешчана незалежнасць краіны.

У снеж. 1962 абвешчана рэспубліка на чале з прэзідэнтам Ньерэрэ, 10.12.1963 абвешчана незалежнасць Султаната Занзібар. Паўстанне 12.1.1964 скінула манархію на Занзібары і паклала канец панаванню выхадцаў з Амана; да ўлады прыйшла Афра-шыразі партыя (АШП). 26.4.1964 Танганьіка і Занзібар аб'яднаны ў адзіную дзяржаву (з 29.10.1964 — Аб'яднаная Рэспубліка Т.); Занзібар пры гэтым захаваў значную аўтаномію. Па ініцыятыве Ньерэрэ ў краіне пачалася пабудова сацыяліст. грамадства шляхам аб'яднання сял. гаспадарак у калектыўныя — т.зв. уджамаа; нацыяналізаваны замежныя банкі і прадпрыемствы. У 1977 ТАНУ і АШП аб'яднаны ў Рэв. партыю (РП), усе інш. партыі забаронены. У пач. 1980-х г. эканам. становішча Т. пагоршылася, што прымусіла Ньерэрэ падаць у 1985 у адстаўку. Новае кіраўніцтва краіны і РП на чале з А.Х.Мвіньі пачало лібералізацыю эканомікі, што спрыяла пераадольванню крызісу. У 1992 дазволена шматпартыйнасць. На першых шматпартыйных выбарах 1995 перамагла РП, яе прадстаўнік Б.У.Мкапа абраны прэзідэнтам Т. Т. — чл. ААН (з 1961), Арг-цыі афр. адзінства. Дыпламат. адносіны паміж Т. і Рэспублікай Беларусь з мая 1996. У Т. дзейнічаюць паліт. партыі: Рэв. партыя, Нац. канвенцыя за стварэнне і рэформы, Аб'яднаны грамадз. фронт, Аб'яднаная дэмакр. партыя, Партыя дэмакратыі і прагрэсу.

Гаспадарка. Т. — эканамічна слабаразвітая агр. краіна, уваходзіць у лік 25 найменш эканамічна развітых краін свету. Валавы ўнутр. прадукт (ВУП) расце больш марудна, чым насельніцтва, складае каля 250 дол. на 1 чал. ў год. 25% ВУП ствараецца ў сельскай гаспадарцы, лесаводстве, рыбалоўстве, паляўніцтве, 14,4% — у прам-сці, энергетыцы, будаўніцтве, 4,9% — у транспарце і сувязі, 14,8% — у гандлі, атэлях і рэстаранах, 40,9% — у інш. абслуговых галінах. У сельскай гаспадарцы выкарыстоўваецца каля 52 млн. га (каля 55% тэр. краіны), у т.л. каля 10,4 млн. га ў раслінаводстве і каля 31,6 млн. га ў жывёлагадоўлі. Частка зямель арашаецца. Праведзена агр. рэформа, ёсць с.-г. кааператывы і дзяржгасы. У некаторых раёнах захоўваецца абшчыннае землеўладанне. Узровень с.-г. вытв-сці



Да арт. **Танзанія**. У запаведніку Серэнгеці.



Да арт. **Танзанія**. Узбярэжжа вострава Занзібар.

непастаянны, церпіць страты ад неспрыяльных умоў надвор'я, недахопу ўгнаенняў, паліва і машын. Пераважае матычнае раслінаводства. Збор асн. харч. культур (1999, млн. т): кукурузы 2,8, рысу 0,9, маніёку 2,2. Сеюць таксама пшаніцу, проса, сорга, бабовыя, маніёк, батат, алейныя культуры і агародніну.

Асн. экспартныя культуры (1999, тыс. т): кава 37,1, зялёны чай 120,6, бавоўна 133,5, арэхі кэш'ю 75,8, тытунь 37,9, сізаль 24 (1-е месца ў свеце). На а-вах Занзібар і Пемба плантацыі гваздзіковага дрэва (1-е месца ў свеце, каля 60—80% сусв. вытв-сці) і какосавых пальмаў. Вырошчваюць таксама цукр. трыснёг, арахіс, бананы, пірэтрум. Трапічнае садоўніцтва. Харч. культуры вырошчваюць амаль паўсюдна, экспартныя — у асобных раёнах: каву — у горных і перадгорных раёнах, на схілах вулкана Рунгве, чай — на схілах Кіліманджара, бавоўну — на паўд. узбярэжжы воз. Вікторыя, арэхі кэш'ю — на ўзбярэжжы акіяна, тытунь і пірэтрум — каля г. Ірынга, сізаль — у раёнах гарадоў Дар-эс-Салам і Танга. Жывёлагадоўля малатаварная, развіта ў раёнах, дзе няма мухі цэцэ. Колькасць жывёлы ў многіх этнічных групах мае прэстыжны характар, таму яе забіваюць вельмі рэдка. Пагалоўе (1997, млн. галоў): буйн. раг. жывёлы 14,4, коз 9,9, авечак 4,2. Каля 75% пагалоўя скандэнтравана ў раёне воз. Вікторыя, на ПнУ і ў цэнтр. раёнах. Пераважае паўкачавая, адгонна-пашавая і пашавая жывёлагадоўля. Развіццё галіны стрымліваецца эпізаотыямі і недастатковай абводненасцю значнай часткі пашы. Птушкагадоўля (больш за 28 млн. курэй). Рыбалоўства ў моры і азёрах (357,2 тыс. т, 1999). Паляўніцтва. У прам-сці пераважаюць дробныя прадпрыемствы па перапрацоўцы с.-г. прадукцыі, тэкст. і абутковыя ф-кі, з-ды па вытв-сці ўгнаенняў, буд. матэрыялаў і цэменту. Вядзецца здабыча золата, алмазаў, рубінаў, сапфіраў, каменнай солі, фасфарытаў, гіпсу, жал. руды, волава і кааліну. На ПдЗ здабываюць кам. вугаль (каля 300—400 тыс. т штогод). На Пд ад г. Дар-эс-Салам пачата здабыча прыроднага газу. Энергетыка заснавана на выкарыстанні гідраэрэсурсаў (каля 70%) і імпартнай нафты (каля 30%). Найб. ГЭС на р. Пангані. У 1999 атрымана 1,7 млрд. кВт · гадз. электраэнергіі. Вытв-сць асн. прамысл. прадуктаў (1999): цукру — 153 тыс. т, цыгарэт — 3,4 млн. шт., піва — 123,9 млн. л, тэкстылю — 49,8 млн. м^2, цэменту — 833 тыс. т, металапракату — 9,5 тыс. т, нафтапрадуктаў — 287 тыс. т, фарбаў — 12,9 млн. л. Працуюць нафтаперапр., цэм., аўтазборачны з-ды (Дар-эс-Салам), шынны і фармацэўтычны з-ды (Аруша), цукр. з-д і кавaперапр. ф-ка (Букоба) і інш. Развіты саматужныя рамёствы: пашыў нац. адзення і абутку, выраб посуду, упрыгожанняў, цыновак і сувеніраў. Транспарт чыг., аўтамаб., унутр. водны і марскі. Даўж. (1999, тыс. км): чыгункі — 4,4, аўтадарог — 88,2, у т.л. з цвёрдым пакрыццём 3,7, унутр. водных шляхоў (у асн. па азёрах) — каля 0,8. Нафтаправод з Дар-эс-Салама ў г. Ндола (Замбія). У краіне 55 тыс. легкавых, 78,8 тыс. грузавых аўтамабіляў і аўтобусаў (2000). Гал. марскія парты Дар-эс-Салам, Танга, Лінды, Занзібар, азёрныя — Мванза (воз. Вікторыя), Кігома (воз. Танганьіка). Праз марскія парты Т. ідзе значная частка знешнеэканам. сувязей Уганды, Бурундзі, Руанды, Замбіі. У краіне больш за 100 аэрапортаў і пасадачных пляцовак, у т.л. 3 міжнар. аэрапорты (каля гарадоў Дар-эс-Салам, Аруша і Занзібар). У 1999 экспарт склаў 828 млн. дол., імпарт — 1440 млн. дол. У экспарце пераважаюць кава, чай, бавоўна, сізаль, арэхі кэш'ю, мінер. сыравіна, тытунь, у імпарце — спажывецкія тавары, абсталяванне і трансп. сродкі, паўфабрыкаты і камплектуючыя вырабы, нафта. Гал. гандл. партнёры: Паўд.-Афр. Рэспубліка, Японія, Кенія, Германія, Вялікабрытанія, Саудаўская Аравія. Знешні доўг больш за 7,7 млрд. дол. Краіна знаходзіцца ў стане пастаяннага знешнегандл. дэфіцыту. Дапамога складае каля 1 млрд. дол. штогод, паступае ад міжнар. арг-цый, а таксама скандынаўскіх краін, Вялікабрытаніі, Германіі, Японіі, Італіі, Канады. У Т. самыя вядомыя запаведнікі Афрыкі, якія прыцягваюць турыстаў з усяго свету. Даходы ад абслугоўвання турыстаў і продажу паляўнічых ліцэнзій (каля 300—500 млн. дол. штогод) — важная крыніца папаўнення бюджэту. Грашовая адзінка — танзанійскі шылінг.



Да арт. **Танзанія**. Горад Мошы каля падножжа Кіліманджара.

Архітэктура, выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. У раёнах Кандоа, Кісесе, Тамбала, Мванза выяўлены наскальны жывапіс верхняга палеаліту (прымітыўныя выявы фантаст. жывёл) і неаліту (наіўна-рэаліст. сцэны палявання, бітваў і інш.). У 7—15 ст. развівалася мусульм. архітэктура, захаваліся шматлікія палацы, мячэці (Вял. мячэць у Кілва-Кісівані), жылыя дамы з каралавага вапняку і інш. З канца 19 ст. паводле праектаў еўрап. ахітэктараў забудоўваліся партовыя гарады (Дар-эс-Салам) і гандл. цэнтры (Мошы, Дадома). Традыц. сельская забудова — прамавугольныя ў плане жытлы з канічнымі ці плоскімі дахамі, нізкія хаціны акруглай формы (у народа масаі), у выглядзе вял. кашоў з галерэяй па акружнасці (у макондэ), конусападобныя буданы (у джага). У 2-й пал. 20 ст. пашырылася буд-ва грамадскіх аб'ектаў, пасёлкаў з 1- і 2-павярховымі дамамі, складзены праект планіроўкі г. Занзібар. У мастацтве пераважае драўляная скульптура: слупападобныя фігуры, звязаныя з культам продкаў у народаў сукума і хехе, экспрэсіўныя фігуры танцуючых жанчын у макондэ, гратэскныя фігуры чалавека з рухомымі канечнасцямі ў вазарама, выявы жывёл у джага.

Характэрны антрапаморфныя маскі, манахромныя ці размаляваныя, з багатым дэкорам, які імітуе татуіроўку. У 2-й пал. 20 ст. пачала складвацца нац. школа жывапісу: партрэты і сцэны з сял. жыцця С.Дж.Нтыра, нацюрморты В.Мача, жанравыя кампазіцыі Ф.К.Мзангі, Т.Ф.Абдулы і інш. Сярод маст. рамёстваў· найб. пашыраны разьба па дрэве, пляценне, ганчарства.

ТАНЗІЛІ́Т (ад лац. tonsilla міндалепадобная залоза) х р а н і ч н ы, хранічнае запаленне глотачных *міндалін* (пераважна паднябенных). Узбуджальнікі: гемалітычны стрэптакок групы А, стафілакокі, вірусы, грыбкі. Бывае Т. кампенсаваны (пачырваненне і рубцовыя змены міндалін, гнойныя пробкі, пачырваненне і патаўшчэнне краёў нёбных дужак, павелічэнне і балючасць шыйных і падсківічных лімфавузлоў, боль, сухасць, непрыемны пах з рота і інш.) і дэкампенсаваны (частыя абвастрэнні, узнікненне каля міндалінных абсцэсаў, субфебрыльная т-ра цела і інш.). Прыводзіць да развіцця пашкоджанняў сэрца, рэўматызму, сепсісу. Лячэнне тэрапеўт., хірург. (танзілектамія). *І.М.Семяненя.*

ТАНЗІМА́Т (ад араб. танзім — упарадкаванне), назва рэформ у Турцыі ў сярэдзіне 19 ст., якія мелі на мэце ўзмацненне Асманскай імперыі. Пачаліся з выдання 3.11.1839 султанам рэскрыпта з абяцаннем забяспечыць недатыкальнасць жыцця, гонару і маёмасці ўсіх падданых, уладкаваць падаткаабкладанне, правесці ваен. рэформу. У далейшым прыняты крымінальны і камерцыйны кодэксы, скасавана сістэма водкупаў, створаны першыя свецкія школы, рэарганізавана адм. кіраванне краінай, уведзены ўсеагульны ваен. абавязак (для мусульман). Але з-за супраціўлення кансерватараў і мусульм. духавенства рэформы ажыццёўлены толькі часткова. Рэскрыптам ад 18.2.1856 засн. першыя банкі, зроблены крокі па юрыд. афармленні сістэмы прыватнай маёмасці на зямлю. Аднак з прыходам да ўлады *Абдул-Хаміда II* у 1876 рэформы прыпынены.

ТАНЗУ́РА (ад лац. tonsura стрыжка), паголенае месца на макушцы галавы, знак прыналежнасці да каталіцкага *духавенства.*

ТАНІ́НА-АНІ́ЎСКІ ПАЎВО́СТРАЎ. На ПдУ в-ва Сахалін, Расія. Абмываецца Ахоцкім м. Заканчваецца на Пн мысам Свабодны (Танін), на Пд — мысам Аніва. Даўж. 90 км, шыр. 3—19 км. З Сахалінам злучаны Мураўёўскім пера-

шыйкам. Уздоўж узбярэжжа цягнецца Таніна-Аніўскі горны хрыбет (выш. да 670 м). Ялова-піхтавая тайга ахоцкага тыпу.

ТАНІ́НЫ (ад франц. tanner дубіць скуру), група фенольных злучэнняў раслін. Паводле хім. будовы — складаныя эфіры фенолкарбонавых к-т (напр., галавай) з многаатамнымі спіртамі (напр., глюкозай), кандэнсаваныя фенолы і інш.

Ёсць у кары, драўніне, лісці і (або) пладах многіх відаў раслін (напр., у кары дуба да 20% Т., вярбы да 13%). Маюць вяжучыя ўласцівасці. Асаджаюць бялкі з растворaў. Прыгнечваюць рост многіх патагенных для раслін мікраарганізмаў, ахоўваюць расліны ад паядання жывёламі (антыфіданты). Выкарыстоўваюцца пры дубленні скур, у медыцыне.

ТАНІ́РАВАННЕ, вірыраванне, спосаб апрацоўкі пазітыўных фатагр. відарысаў з мэтай змены іх афарбоўкі. Відарысы афарбоўваюць у карычневы, сіні, зялёны, чырвоны ці інш. колер (часам у навук. фатаграфіі ў 2 колеры). Пры прамым (1-растворным) Т. серабро відарыса пераводзіцца ў афарбаваную соль серабра. Пры непрамым (2- ці 3-растворным) Т. відарыс спачатку адбельваецца (гл. *Адбельванне* фатаграфічнае), пасля афарбоўваецца.

ТАНІРО́ЎКА, дэкаратыўная апрацоўка скульптуры (гал. чынам з танных матэрыялаў — металу, гіпсу і інш.) з дапамогай розных хімічных рэчываў з мэтай імітацыі інш. матэрыялу (бронзы, мармуру, медзі, дрэва і інш.). Садзейнічае больш выразнаму выяўленню пластычных форм. Т. наз. таксама прыглушэнне фарбамі белых і інш. плям пры рэстаўрацыі твораў жывапісу і графікі.

ТАНІ́ЧНАЕ ВЕРШАСКЛАДА́ННЕ (ад грэч. tonos націск), сістэма *вершаскладання*, у аснове якой аднолькавая (прыблізна аднолькавая) колькасць моцных, або апорных, націскаў у вершаваных радках. Колькасць ненаціскных складоў паміж імі розная (ад 0 да 8).

Ва ўсх.-слав. вершаскладанні літ. танічны верш склаўся ў 19 — пач. 20 ст. на аснове *народнага вершаскладання*, танічнага па сваёй прыродзе. Танічны верш і нар. верш пры іх вял. падабенстве (і там і тут роўная колькасць моцных націскаў у радках) усё ж значна адрозніваюцца. Гал. адрозненне — у функцыі моцных (апорных) націскаў: калі ў нар. вершаскладанні націск выконваў рытмічную ролю, мог падаць на малазначныя (у т.л. службовыя) словы, то ў літ. танічным вершы ён мае сэнсавае значэнне і абавязкова прыпадае на найб. значнае па сэнсе слова, рытмічна падкрэслівае, выдзяляе яго. Націску ў танічным вершы памагаюць шматлікія паўзы.

Вылучаюць некалькі відаў Т.в.: акцэнтна-складовы верш (аднолькавая колькасць акцэнтаў — моцных націскаў, аднолькавая колькасць складоў у вершаваных радках), *дольнік*, *тактавік*, акцэнтны верш (аднолькавая або прыблізна аднолькавая колькасць акцэнтаў у радках). Кожны з іх вызначаецца пэўнай колькасцю моцных націскаў у вершаваных радках. Разам з тым яны адрозніваюцца сваёй мерай свабоды ў дачыненні да колькасці складоў у радках, колькасці ненаціскных складоў паміж націскамі, ужывання рыфмы і г.д. Першыя ўзоры літ. Т.в. — пераважна стылізацыя нар. творчасці (творы А.Кальцова, «Казка пра рыбака і рыбку» А.Пушкіна). На аснове ўкр. нар. верша Т.Шаўчэнка стварыў свой тып верша — т.зв. *каламыйкавы верш* з аднолькавай колькасцю складоў у радках. Вял. ролю ў развіцці Т.в. адыграла паэзія У.Маякоўскага. Танічным вершам напісаны «Тарасова доля», «Бандароўна» Я.Купалы, «Страцім-лебедзь» М.Багдановіча, «Босыя на вогнішчы» М.Чарота, шырока ўжывалася ў творчасці М.Танка, П.Панчанкі, К.Кірэенкі і інш.

В.П.Рагойша.

ТАНК (англ. tank бак, рэзервуар), баявая гусенічная браніраваная машына высокай праходнасці і рухомасці; асн. від узбраення *танкавых войск*. Здольны выяўляць і паражаць розныя цэлі на полі бою, ажыццяўляць манеўры і захоўваць баяздольнасць пры агнявым уздзеянні праціўніка, здзяйсняць маршы на вял. адлегласці, пераадольваць перашкоды і загароды. Забяспечваюць вайскам магчымасць прарыву абароны праціўніка, развіцця поспеху, арганізацыі трывалай абароны, вядзення высокаманеўраных баявых дзеянняў. Падзяляліся на лёгкія (да 20 т), сярэднія (да 40 т) і цяжкія (больш за 40 т). З 1960-х г. выкарыстоўваецца баявы Т. шматмэтавага прызначэння. Асн. ўзбраенне — *гармата* калібру 105—152 мм, дапаможнае — 1—3 *кулямёты* (спараныя, зенітныя), часам таксама *агнямёты*, рэактыўнае ўзбраенне. Экіпаж 3—4 чал., скорасць 41—70 км/гадз, маса 36—55 т. На ўзбраенні армій шэрагу краін ёсць лёгкія авіятранспартабельныя Т. (*«амфібіі»*).

Асн. элементы канструкцыі Т.: бранявы корпус і вежа (літыя або зварныя), комплекс узбраення (асн. і дапаможная зброя, сістэма кіравання агнём, боепрыпасы і інш.), сілавая ўстаноўка (поршневыя і газатурбінныя рухавікі ўнутр. згарання), сілавая перадача (мех., гідрамех. і электрамех. трансмісіі), хадавая частка, электраабсталяванне (сістэмы энергазабеспячэння і эл. пуску рухавіка, прылады



Танк: а — боепрыпасы для 125-міліметровай танкавай гарматы; б — схема танка (1 — паліўныя бакі; 2 — зарады; 3 — снарады; 4 — гармата; 5 — спараны кулямёт; 6 — зенітны кулямёт з дыстанцыйным кіраваннем; 7 — рухавік; 8 — боеўкладка аўтамата зараджання; 9 — апорныя каткі).



Танкі 1-й і 2-й сусветных войнаў: 1 — англійскі «Марк-IV»; 2 — нямецкі Т-III; 3 — М4 «Шэрман» (ЗША); 4 — сярэдні савецкі Т-34-85 (1943).

кантрольна-вымяральныя, асвятлення і сігналізацыі), сродкі сувязі (радыёстанцыі), спец. абсталяванне (проціпажарнае, сістэм аховы ад зброі масавага паражэння і маскіроўкі). Для пераадолення водных перашкод (глыб. да 6 м) Т. аснашчаюцца абсталяваннем падводнага ваджэння, вадаходным рухачом.

Першыя праекты Т. прапанаваны ў Расіі (В.Дз.Мендзялееў, А.А.Парахоўшчыкаў, 1911—15), Вялікабрытаніі (Д.Моль, 1912), Аўстра-Венгрыі (Г.Бурштын, 1913). Пабудаваныя ў 1915—16 у Вялікабрытаніі Т. (32 «Марк-І») упершыню выкарыстаны ў верасні 1916 на р. Сома (Пн Францыя) у баі англа-франц. войск з германскімі. «Марк-IV» — у 1917. Т. выпускаліся таксама ў Францыі (з 1916), Германіі (з 1918), ЗША (з канца 1-й сусв. вайны). Браня гэтых Т. ахоўвала ад куль і лёгкіх асколкаў, яны прызначаліся ў асн. для падтрымкі пяхоты і выкарыстоўваліся абмежавана. Сав. Т. пачалі выпускацца ў 1920; у 1931—38 — лёгкія Т-26, БТ, сярэднія Т-28, цяжкія Т-35, *танкеткі* Т-27, малыя плавающыя Т-37, Т-38. У 1938—40 створаны Т. з процінарадным браніраваннем: сярэдні Т-34 (з 76-мм даўгаствольнай гарматай, канструктар М.І.*Кошкін* і інш.) і цяжкі КВ-1. Удасканалены ў 1943 Т-34-85 стаў лепшым Т. 2-й сусв. вайны. У гады Вял. Айч. вайны ў СССР выпускаліся Т. КВ-1С (1941), КВ-85 (1943), ІС-1 (1943) і інш. На базе Т. былі створаны *самаходныя артылерыйскія ўстаноўкі*. Германія ў 2-й сусв. вайне выкарыстоўвала Т. лёгкія Т-I, Т-II, сярэднія Т-III (пры нападзе на Польшчу, Францыю, СССР), Т-IV, цяжкія Т-V «Пантэра» і Т-VI «Тыгр» (1943); ЗША — М-4 «Шэрман» (асн. Т. саюзнікаў пасля 1942), М-26. Сярэднія і цяжкія Т. 2-й сусв. вайны былі аднавежавыя, з процінарадным браніраваннем, узброены гарматамі 50—122 мм. У пасляваен. перыяд Т. канструяваліся з улікам магчымасці іх выкарыстання ва ўмовах ядз. вайны. У 1980-х г. у СССР з'явіліся Т-72Б (найб. пашыраныя ва Узбр. Сілах Беларусі), Т-72БВ, Т-80У, Т-80УД, Т-84. Найб. аптымальныя баявыя і эксплуатацыйна-тэхн. якасці ў танка Т-90 (Расія). Найб. вядомыя Т. зах. краін: «Леапард» 2 (ФРГ, прыняты на ўзбраенне ў 1979), МІ «Абрамс» (ЗША, 1980), «Чэленджэр» (Вялікабрытанія), «Леклерк» (Францыя), «Меркава» (Ізраіль). Асн. іх асаблівасць — істотнае павышэнне жывучасці на полі бою за кошт павелічэння браніравання, зніжэння сілуэта, выкарыстання большых вуглоў нахілу зварных бранявых канструкцый, камбінаванай і разнесенай брані ў корпусе і вежы, сродкаў па лакалізацыі пашкоджанняў. Яны аснашчаны дасканалымі комплексамі ўзбраення, магутнымі рухавікамі, гідрамех. трансмісіяй. Існуюць і бязвежавыя Т. (шведскі STRV-103).

Літ.: Танки и танковые войска. М., 1970; Современные танки. М., 1995; Энциклопедия танков: Полная энцикл. танков мира, 1915—2000 гг. / Сост. Г.Л.Холявский. Мн., 2000; Современная бронетанковая техника: Справ. пособие. Мн., 1998; Шунков В.В. Танки. Мн., 2000.

М.П.Брэль.

ТАНК Максім (сапр. Скурко Яўтен Іванавіч; 17.9.1912, в. Пількаўшчына Мядзельскага р-на Мінскай вобл. — 7.8.1995), бел. паэт, грамадскі дзеяч. Нар. паэт Беларусі (1968). Акад. АН Беларусі (1972). Герой Сац. Працы (1974). У 1916—21 з бацькамі-бежанцамі апынуўся ў Маскве. У 1922 сям'я вярнулася ў Пількаўшчыну. Вучыўся ў Вілейскай, Радашковіцкай, Віленскай бел. гімназіях. У 1932 за ўдзел у падп. камсамольскай рабоце арыштаваны і зняволены ў Лукішскую турму (праз месяц вызвалены). Працаваў інструктарам ЦК КСМЗБ (1932—33), вёў рэв. дзейнасць на Віленшчыне і Навагрудчыне. Неаднойчы быў арыштаваны, прасядзеў у турмах каля 2 гадоў. Пасля ўз'яднання Зах. Беларусі з БССР (1939) працаваў у сельскім к-це, у газ. «Віленская праўда», вілейскай абл. «Сялянскай газеце». У пач. Вял. Айч. вайны эвакуіраваўся ў г.



М.**Танк**.

Саратаў, уступіў у нар. апалчэнне. Пасля накіраваны на Бранскі фронт, супрацоўнічаў у газ. «За Савецкую Беларусь», якую рэдагаваў М.Лынькоў. Працаваў у рэдакцыі газеты-плаката «Раздавім фашысцкую гадзіну». У 1948—67 гал. рэдактар час. «Полымя». У 1967—90 старшыня праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Свае першыя вершы змясціў у 1931 у рукапісным час. «Пралом» пад псеўд. А.Граніт. Псеўданім Максім Танк з'явіўся 7.4.1932 у львоўскай газеце-аднадзёнцы «Беларускае жыццё». У канцы 1933 у турме пры падтрымцы палітвязняў выдаваў рукапісны час. «Краты» (выйшла 6 нумароў). З 2-й пал. 1930-х г. на рабоце ў легальных выданнях, што выяўлялі ідэі антыфаш. Нар. фронту: газ. «Наша воля», «Беларускі летапіс», што выдаваў Р.Шырма, час. «Калоссе». Тут друкаваў вершы, апавяданні, літ.-крытычныя і публіцыст. артыкулы, у якіх адстойваў ідэі супраціўлення фашызму, нац. вызвалення. На сродкі Шырмы і КПЗБ у Вільні выйшаў першы яго зб. «На этапах» (1936, канфіскаваны). Кнігі «Журавінавы цвет» і паэма «Нарач» (абедзве 1937) таксама канфіскаваны польскімі ўладамі. Ранняя ідэйна-паліт. сталасць, шырыня светапогляду абумовілі хуткае яго станаўленне як мастака слова. Грунтоўнае веданне фальклору, творчая вучоба ў класікаў бел., рус., укр. і польск. л-р, шырокае знаёмства з еўрап. культурай паскорылі фарміраванне ўласнага паэт. стылю Т. Ад вучнёўскага перайманння, вобразнай ускладненасці, моўнай каструбаватасці паасобных вершаў паэт даволі хутка перайшоў да самаст. маст. мыслення. Лёс і духоўны свет зах.-бел. працоўных выяўлены ім у грамадзянскай, філасофскай, пейзажнай і інтымнай лірыцы, гумарыст. і сатыр. вершах, баладах, песнях, казках, гераіка-рамант. паэмах («Нарач», «Каліноўскі», «Журавінавы цвет»,



1



2



3



4



5



6

Сучасныя танкі: 1 — Т-72Б (на ўзбраенні ў арміі Беларусі); 2 — М1А2 «Абрамс» (ЗША); 3 — «Леапард 2Е» (ФРГ); 4 — «Леклерк» (Францыя); 5 — «Меркава-3» (Ізраіль); 6 — Т-90С (Расія).

«Сказ пра Вяля»). У час Вял. Айч. вайны ў яго творчасці пераважалі сатыр.-выкрывальныя і публіцыст.-пафасныя жанры. Заклікі змагацца супраць фашызму, нічога не шкадаваць дзеля перамогі, паэтызацыя подзвігу воіна, услаўленне неўміручасці роднага краю, народа, культуры і мовы — асн. матывы яго ваен. лірыкі («Падымайся, Беларусь», «Не шкадуйце, хлопцы, пораху», «Родная мова»). У паэме «Янук Сяліба» (1943) імкнуўся паказаць гераіку партыз. руху на Беларусі. Патрыят. творы ваен. гадоў склалі кн. «Вастрыце зброю» і «Праз вогненны небасхіл» (абедзве 1945). Гордасць народа-пераможцы, радасць працы, сум па цяжкіх стратах у зб-ках «Каб ведалі» (1948, Дзярж. прэмія СССР 1948), «На камні, жалезе і золаце» (1951), «У дарозе» (1954), «След бліскавіцы» (1957, Літ. прэмія імя Я.Купалы 1959). У пасляваен. творчасці паэт звярнуўся да гісторыі Беларусі, фальклорных сюжэтаў, славіў працу рабочых і хлебаробаў. Паглыбленне гуманіст. пачатку, узмацненне філасафічнасці лірыкі, пашырэнне і ўдасканаленне сродкаў паэт. выяўлення сталі вядучымі стылёвымі дамінантамі творчасці Т. 1960—1980-х г.: зб-кі «Мой хлеб надзённы» (1962, Дзярж. прэмія Беларусі імя Я.Купалы 1966), «Хай будзе святло» (1972), «Нарачанскія сосны» (1972, Ленінская прэмія 1978), «Прайсці праз вернасць» (1979, Літ. прэмія імя А.Фадзеева 1980), «За маім сталом» (1984). Паэзія Т. глыбока народная і нацыянальная, разуменне ім маралі, дабра і зла, прыгожага і агіднага грунтуецца на этычных і эстэт. поглядах бел. хлебароба. Яго паэзіі ўласцівы інтэлектуалізм; шырокамаштабнасць, найноўшыя маст. формы і сродкі, багацце вобразнай, рытміка-меладычнай (верш сілаба-танічны, танічны, дольнік, верлібр), страфічнай (тэрцэт, катрэн, санет і інш.) арганізацыі верша. З канца 1950-х г. у яго паэзіі адрадзіўся сатыр. жанр (зб. «Селядцы з вершамі», 1966). Сувязь з фальклорам выявілася ў вершах для дзяцей (зб-кі «Галінка і верабей», 1946; «Казкі лірніка», 1948; «Ехаў казачнік Бай», 1955; «Светлячок», 1970; «Быліна пра касмічнае падарожжа мураша Бадзіні», 1979; «Лемантар», 1993). Выступаў і як празаік-дакументаліст (кніга-дзённік «Лісткі календара», 1970). Многія творы паэта пакладзены на музыку. Пераклаў на бел. мову асобныя творы А.Пушкіна, А.Міцкевіча, Ю.Славацкага, У.Маякоўскага, У.Бранеўскага і інш. Ганаровы грамадзянін г. Мінск (1987), г.п. Радашковічы Маладзечанскага р-на (1992). Сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў СССР (1966—86).

Тв.: Зб. тв. Т. 1—4. Мн., 1966—67; Зб. тв. Т. 1—6. Мн., 1978—81.

Літ.: Бугаёў Дз. Паэзія Максіма Танка. Мн., 1964; Рагойша В. Паэтыка Максіма Танка. Мн., 1968; Калеснік У.А. Максім Танк: Нарыс жыцця і творчасці. Мн., 1981; Верабей А. Максім Танк і польская літаратура. Мн., 1984; Арочка М. Максім Танк: Жыццё ў паэзіі. Мн., 1984.

В.П.Рагойша.

ТА́НКА, монастрафічны 5-радковы нерыфмаваны верш у яп. паэзіі. Мае 31 склад: у 1-м і 3-м вершарадках Т. па 5 складоў, у астатніх — па 7. Традыц. тэматыка — каханне, разлука, падарожжы, поры года. Т. багаты тропамі, гульнёй слоў. Найб. раннія Т. запісаны ў 8 ст., росквіт прыпадае на 10—13 ст. і звязаны з дзейнасцю прыдворнага Ведамства яп. паэзіі, правядзеннем паэт. спаборніцтваў і складаннем афіц. анталогій. Буйнейшыя прадстаўнікі — *Сайгё*, Т.*Ісікава*. У бел. паэзіі 1-я Т. з'явіліся ў паэзіі М.Багдановіча.

ТА́НКАВЫЯ ВО́ЙСКІ, род *сухапутных войск* ва ўзбр. сілах шэрагу дзяржаў (Расія, Украіна, Беларусь, Германія і інш.). У арміях некат. краін (ЗША, Вялікабрытанія і інш.) войскі, аналагічныя танкавым, наз. бранятанкавымі. Прызначаны для вядзення баявых дзеянняў на кантынент. тэатрах самастойна і ва ўзаемадзеянні з інш. родамі войск. Аснову ўзбраення Т.в. складаюць *танкі* розных тыпаў. Арганізацыйна Т.в. складаюцца з танк. злучэнняў і часцей. Як асн. сіла сухап. войск Т.в. пераважна дзейнічаюць на гал. напрамках для нанясення праціўніку магутных і глыбокіх удараў. Яны здольны паспяхова весці *сустрэчны бой*, пераадольваць зоны радыеактыўнага, хім. заражэння і інш., а таксама ствараць трывалую абарону.

Упершыню танкі былі выкарыстаны англ. арміяй у вер. 1916 у 1-ю сусв. вайну. У Чырв. Арміі з 1918 існавалі бранявыя аўтамаб., аўтатанк. атрады і бронепаязды, пазней бранявыя сілы; з 1934 называліся аўтабранятанк., з 1942 — бранятанк. і механізаваныя войскі. У Вял. Айч. вайну ў складзе франтоў існавалі танк. арміі, у т.л. 1-я, 2-я, 5-я гв., якія арганізацыйна ўваходзілі ў 1-ы, 2-і і 3-і Бел. франты. Т.в. адыгралі вырашальную ролю ў шэрагу бітваў і аперацый, напр., у *Беларускай аперацыі 1944*. З 1954 наз. бранятанк. войскамі, з 1960 — Т.в.

У пач. 1990-х г. на тэр. Беларусі размяшчаліся 2 танк. арміі (7-я і 5-я гв.), а таксама танк. часці ў складзе інш. армій і злучэнняў. Паводле выніковага акта Хельсінкскага пагаднення (1992), Дагавора аб звычайных узбр. сілах у Еўропе (1992), Рэспубліка Беларусь скараціла больш за 2 тыс. танкаў, 1,5 тыс. адзінак баявых машын пяхоты і інш. Падраздзяленні Т.в. маюць на ўзбраенні сучасныя танкі і ўваходзяць у склад сухапутных войск Узбр. Сіл Рэспублікі Беларусь.

С.М.Абрамаў, А.І.Аніська.

ТАНКАДРО́М (ад *танк* + грэч. dromos бег, месца для бегу), участак мясцовасці, абсталяваны для навучання ваджэнню танкаў і інш. баявых гусенічных машын. Для Т. выбіраюць мясцовасць з разнастайным рэльефам, наяўнасцю водных перашкод, воддаль ад населеных пунктаў, дарог, ліній сувязі і электраперадач. На Т. абсталёўваюцца вучэбныя месцы і класы, камандныя пункты, якія аснашчаюцца аўтам. сістэмай кіравання і сродкамі для назірання за месцазнаходжаннем танкаў і сувязі з імі. Межы Т., небяспечныя ўчасткі і напрамкі руху машын пазначаюцца спец. паказальнікамі, знакамі і надпісамі.

С.В.Папоў.



Да арт. **Танкавыя войскі**. Атака танкавага падраздзялення ў час вучэння «Захад-81».



Да арт. **Танкавыя войскі**. Танкавае падраздзяленне на маршы ў час аператыўна-тактычнага вучэння «Нёман-2001».



Танканог грабеньчаты

лёў. Каля 400 відаў. Пашыраны ўсюды, акрамя палярных абласцей, найб. шматлікія ў тропіках. Жывуць на лугах, палях, у лясах, хмызняках. Актыўныя на змярканні. На Беларусі 9 відаў. Найб. трапляюцца Т.: хмелевы (Hepialus humuli), верасовы (Phymatopus hecta).

Размах крылаў да 24 см. Характэрна аднолькавае жылкаванне пярэдніх і задніх крылаў. Вусікі кароткія. Вусені маюць 5 пар брушных ножак; жывуць у глебе, некат. віды — у сцёблах травяністых раслін, у ствалах і каранях дрэў. *С.Л.Максімава.*

ТАНКАРУ́ННЫЯ АВЕ́ЧКІ, пароды авечак з аднароднай тонкай воўнай з пухавых валокнаў. *Руно* шпатэлепадобнае. Т.а. характарызуюцца высокай воўнавай прадукцыйнасцю, воўна вызначаецца правільнай пакручастасцю і вял. колькасцю тлушчапоту. Пароды Т.а. з воўнай найлепшай якасці — *мерыносы*. Паводле кірунку прадукцыйнасці падзяляюцца на воўнавыя, воўнава-мясныя і мяса-воўнавыя пароды. Воўнавыя Т.а. (*азербайджанскі горны мерынос, грозненская парода, стаўрапольская парода*, сальская) сярэдніх памераў, маса 45—55 кг, настрыг воўны 4,5—7 кг. Воўнава-мясныя Т.а. (*асканійская парода, савецкі мерынос*, алтайская, забайкальская, каўказская, кіргізская пароды) больш буйныя, маса 55—60 кг, настрыг воўны 4,5—6 кг. Для мяса-воўнавых пород (*прэкас*, валгаградская, вяцкая, дагестанская горная, казахскі архарамерынос, краснаярская) характэрны буйны рост і добра вызначаныя мясныя формы, маса 60—65 кг, настрыг воўны 4,5—5,5 кг.

ТАНКАСЦЕ́ННЫЯ КАНСТРУ́КЦЫІ, будаўнічыя канструкцыі, таўшчыня якіх значна меншая за іншыя памеры (пралёт, папярочнае сячэнне). Спалучаюць лёгкасць з высокай трываласцю. Да Т.к. адносяцца *абалонкі, купалы, скляпенні*, складкі і інш.

Робяцца з металаў, жалезабетону, слаістых пластыкаў і інш. матэрыялаў. Выкарыстоўваюцца пры буд-ве прамысл. і грамадскіх будынкаў (выставачных павільёнаў, канцэртных залаў, спарт. збудаванняў), інж. збудаванняў (бункераў, сіласасховішчаў, рэзервуараў і да т.п.). Для разліку Т.к. выкарыстоўваюць тэорыі ўстойлівасці, пругкасці і пластычнасці. На Беларусі з Т.к. пабудаваны купал Камароўскага рынку ў Мінску і інш. *І.І.Леановіч.*

ТА́НКЕР (англ. tanker ад tank бак, рэзервуар), грузавое наліўное судна для перавозкі вадкіх і паўвадкіх грузаў (сырой нафты і нафтапрадуктаў, кіслот, звадкаваных газаў, алею, спірту і інш.).



Танкер «ЭССО Германія»: 1 — грабны вінт; 2 — машынная надбудова; 3 — памяшканні для каманды; 4 — сігнальная мачта з радарам; 5 — вогнетушыльная пушка (гармата) і трубаправоды; 6 — пражэктарная мачта; 7 — загрузачныя лініі; 8 — пярэдняя сігнальная мачта.

ТАНКАНО́Г, келерыя (Koeleria), род кветкавых раслін сям. метлюжковых (злакавых). Каля 50 відаў. Пашыраны пераважна ў нетрапічных раёнах. На Беларусі 4 віды Т.: вялікі (K. grandis), грабеньчаты (K. cristata), Дэлявіня (K. delavignei), шызы (K. glauca). Трапляюцца ў светлых барах, на пясчаных глебах.

Шматгадовыя травяністыя карэнішчавыя расліны, утвараюць дзярніны. Шэра-зялёныя сцёблы прамастойныя, апушаныя. Лісце вузкалінейнае, шурпатае. Суквецце — серабрыстая коласападобная мяцёлка. Плод—зярняўка. Кармавыя расліны, выкарыстоўваюцца для замацавання пяскоў. *А.М.Скуратовіч.*

ТАНКАПРА́ДЫ (Hepialidae), сямейства насякомых падатр. раўнакрылых матыльковых. Каля 400 відаў. Пашыраны ўсюды, акрамя палярных абласцей, найб. шматлікія ў тропіках. Жывуць на лугах, палях, у лясах, хмызняках. Актыўныя на змярканні. На Беларусі 9 відаў. Найб. трапляюцца Т.: хмелевы (Hepialus humuli), верасовы (Phymatopus hecta).

Размах крылаў да 24 см. Характэрна аднолькавае жылкаванне пярэдніх і задніх крылаў. Вусікі кароткія. Вусені маюць 5 пар брушных ножак; жывуць у глебе, некат. віды — у сцёблах травяністых раслін, у ствалах і каранях дрэў. *С.Л.Максімава.*



Танкапрад хмелевы: 1 — самец; 2 — самка; 3 — вусень.

Аднапалубнае, з кармавым размяшчэннем машыннага аддзялення, грузавая частка падзелена папярочнымі і падоўжнымі пераборкамі на грузавыя адсекі — танкі. Частка танкаў запаўняецца вадой для забеспячэння патрэбнай пасадкі і астойлівасці судна ў парожнім рэйсе. Звычайна Т. маюць двайное дно і двайныя барты ў танкавай частцы. Аснашчаюцца помпамі для выдалення грузу, процпажарнымі ўстаноўкамі. Грузападымальнасць марскіх Т. да 400—550 тыс. т (супертанкеры), рачных да 5 тыс. т.

ТАНКЕ́ТКА, баявая гусенічная браніраваная машына, узброеная 1—2 кулямётамі. Браніраванне супрацькулявое (да 10 мм), скорасць да 45 км/гадз, экіпаж 1—2 чал. У Сав. Арміі была на ўзбраенні ў пач. 1930-х г. Прызначалася пераважна для разведкі і сувязі.



Танкетка Т-27 (СССР).

ТАНКІ́НСКІ ЗАЛІ́Ў, другая назва заліва *Бакбо*.

ТАНКО́ВІЧ Віктар Сцяпанавіч (н. 16.4.1934, в. Карытніца Вілейскага р-на Мінскай вобл.), бел. вучоны-эканаміст. Канд. эканам. н. (1963), праф. (1993). Скончыў Бел. ін-т нар. гаспадаркі (1956). З 1956 у Ін-це эканомікі АН Беларусі, з 1963 у Бел. эканам. ун-це. Навук. працы па праблемах эканам. механізму гаспадарання ў АПК, рэфармавання с.-г. прадпрыемстваў і іх адаптацыі да рынку.

Тв.: Совершенствование хозрасчета в колхозах и совхозах БССР. Мн., 1974; Хозяйственный расчет в колхозах и совхозах. Мн., 1982; Хозяйственный расчет в системе агропромышленного комплекса. Мн., 1989; Научные основы импортозамещения: На примере импортозамещения продукции АПК. Мн., 1999 (у сааўт.); Экономика предприятий и отраслей АПК. Мн., 2001 (у сааўт.).

ТАНЛЕСА́П, С а п, возера ў Камбоджы, на Камбаджыйскай раўніне; самае вял. на п-ве Індакітай. Пл. мяняецца ад 2,5—3 тыс. км^2 зімой да 10 тыс. км^2 летам, глыб. адпаведна ад 1—2 м да 10—14 м. Берагі нізкія, забалочаныя. Злучана р. Танлесап з р. Меконг і часткова рэгулюе яе сцёк. Выкарыстоўваецца для арашэння рысавых палёў, рыбалоўства. Прыбярэжная зона густа населена; характэрна забудова на палях. Каля Т. — стараж. комплекс *Ангкор*.



У.**Тансыкбаеў**. Качэўе. 1931.

ТАНСЫКБА́ЕЎ Урал (14.1.1904, Ташкент — 18.4.1974), узбекскі мастак. Нар. маст. СССР (1963). Правадз. чл. АМ СССР (1958). Скончыў Пензенскае маст. вучылішча (1929). Творам уласцівы эпічная манументальнасць кампазіцыі, танальнае вырашэнне колеравага ладу, рэалістычнасць. Пісаў пераважна пейзажы: «Качэўе» (1931), «Родны край» (1951), «Ранішнія Кайраккумскай ГЭС» (1957), «На Чарвакскай будоўлі» (1970), цыкл «Родны Узбекістан» (1971—72). Афарміў першы казахскі балет «Калкаман і Мамыр» В.Веліканава, выканаў пано ў павільёне Узбекістана на ВДНГ у Маскве (1952—54). Дзярж. прэмія Узбекістана імя Хамзы 1973.

Літ.: Т а к т а ш Р. У.Тансыкбаев: Альбом репродукций. Ташкент, 1980.

ТА́НТА, горад у Егіпце, у дэльце р. Ніл. Адм. ц. мухафазы Гарбія. Каля 400 тыс. ж. (2001). Вузел чыгунак і аўтадарог, рачны порт. Прам-сць: бавоўнаачышчальная, шэрсцепрадзільная, алейная. Саматужна-рамесніцкая вытв-сць нац. адзення.

ТАНТА́Л, у старажытнагрэчаскай міфалогіі цар *Фрыгіі* ці *Лідыі*, вядомы сваім багаццем. Угнявіў алімп. багоў тым, што выдаваў іх тайны і, каб праверыць іх усёведанне, пачаставаў іх мясам свайго сына *Пелопса*, якога сам і забіў. За свае злачынствы Т. пакараны ў падземным царстве вечнымі пакутамі: стоячы па горла ў вадзе, ён не можа напіцца і сарваць плады з блізкіх галін дрэў. Выраз «танталавы пакуты» азначае пакуты ад усведамлення блізкасці недасягальнай мэты. Міф пра Т. апрацаваны *Сафоклам*.

А.Г.Зельскі.

ТАНТА́Л (лац. Tantalum), Ta, хімічны элемент V групы перыяд. сістэмы, ат. н. 73, ат. м. 180,948. Прыродны Т. — сумесь стабільнага ^{181}Ta (99,9877%) і слаба радыеактыўнага ^{180}Ta (перыяд паўраспаду $1 \cdot 10^{13}$ гадоў). У зямной кары $2,5 \cdot 10^{-4}$% па масе, трапляецца звычайна разам з *ніобіем* (гл. *Танталавыя руды*). Адкрыты ў 1802 швед. вучоным А.Экебергам; назва ад імя міфалагічнага *Тантала* (з-за цяжкасці атрымання ў чыстым выглядзе).

Шэры з сіняватым адценнем пластычны метал, $t_{пл}$ 3014 °С, $t_{кіп}$ каля 5500 °С, шчыльн. 16 600 кг/м^3. У звычайных умовах хімічна ўстойлівы. Раствараецца ў плавікавай кіслаце і яе сумесях з азотнай к-той, гарачай канцэнтраванай сернай кіслаце, расплавах шчолачаў. Кампактны ў паветры пакрываецца тонкай ахоўнай плёнкай пентааксіду Ta_2O_5, акісляецца пры t > 300 °С. Пры награванні ўзаемадзейнічае з хлорам, фторам, вадародам, пры t > 1200 °С — з азотам і вугляродам; нітрыды (Ta_2N, TaN) і монакарбід TaC ($t_{пл}$ каля 3800 °С) вельмі ўстойлівыя да ўздзеяння хім. рэагентаў. Атрымліваюць аднаўленнем Ta_2O_5 вугалем пры 2000 °С у вакууме, калію гептафтортанталату (V) K_2TaF_7 — натрыем. Выкарыстоўваюць як кампанент каразійна- і гарачаўстойлівых сплаваў, для вырабу электраліт. кандэнсатараў, электродаў электронных лямпаў, спец. каразійнаўстойлівай апаратуры ў хім. прам-сці і ядз. энергетыцы, фільер у вытв-сці штучнага валакна, награвальнікаў высокатэмпературных печаў, для касцявога пратэзавання ў медыцыне і інш.

Літ.: Ф е й р б р о т е р Ф. Химия ниобия и тантала: Пер. с англ. М., 1972; Ниобий и тантал. М., 1990.

ТАНТА́ЛАВА ПЯЧО́РА (Tantalhöhle), Т а н т а л ь, карставая пячора ў Зальцбургскіх Альпах, у масіве Хохкёніг, у Аўстрыі. Даўж. 30,6 км. Глыб. да 440 м. Утворана ў вапняках трыясу. Турызм.

ТАНТА́ЛАВЫЯ РУ́ДЫ, прыродныя мінер. ўтварэнні для прамысл. здабычы *танталу*. Больш за 50 мінералаў маюць у сабе тантал; гал. з іх — *танталіт*, калумбіт-танталіт, ваджыніт, мікраліт, ларпарыт, гатчаталіт і інш. *танталаніабаты*. Адрозніваюць руды ўласна танталавыя і комплексныя танталаніобіевыя, з якіх таксама здабываюць рэдказямельныя і радыеактыўныя элементы. Паходжанне эндагеннае высокатэмпературнае. Гал. прамысл. тып радовішчаў — пегматытавы. Радовішчы ў Аўстраліі, Бразіліі, Канадзе, Тайландзе, Дэмакр. Рэспубліцы Конга, Нігерыі, Малайзіі.

ТАНТАЛАНІАБА́ТЫ, прыродныя комплексныя кіслародныя злучэнні *танталу* і *ніобію* з жалезам, марганцам, кальцыем, натрыем, рэдказямельнымі элементамі, ітрыем і інш.; група мінералаў падкласа складаных аксідаў. Тантал і ніобій утвараюць бесперапынныя ізаморфныя рады (напр., *калумбіт — танталіт*, эшыніт — прыярыт, *піразхлор* — мікраліт, эўксеніт — палікраз, фергусаніт — фарманіт). Бываюць крышталічныя і метаміктныя. Крышталізуюцца ў рамбічнай, радзей у кубічнай і тэтраганальнай сінганіях. Колер чорны, буравата-чорны. Цв. 5,5—6. Шчыльн. 5—8,3 г/см^3. Радыеактыўныя. Паходжанне эндагеннае, высокатэмпературнае. Трапляюцца як акцэсорныя мінералы ў гранітах, пегматытах, карбанатытах, таксама ў россыпах. Руда на тантал, ніобій, ітрый.

ТАНТАЛІ́Т (*тантал* + грэч. lithos камень), мінерал падкласа складаных аксідаў, (Fe, Mn) $(Ta, Nb)_2O_6$, крайні член бесперапыннага ізаморфнага рада *калумбіт* — Т. Мае аксід танталу (Ta_2O_5) да 86%, прымесі ніобію, волава, вальфраму, урану, тытану і інш. Крышталізуецца ў рамбічнай сінганіі. Крышталі пласціністыя, прызматычныя, ігольчатыя. Колер чорны, чырванавата-карычневы да ружовага. Цв. 6,5—7. Шчыльн. 6,2—8,2 г/см^3. Крохкі. Радыеактыўны. Паходжанне эндагеннае высокатэмпературнае (у гранітных пегматытах, грэйзенах), трапляецца ў россыпах. Руда танталу і ніобію. Радовішчы ў Канадзе, Бразіліі, Аўстраліі, Мазамбіку, Дэмакр. Рэспубліцы Конга, Расіі, Казахстане і інш.

ТА́НТЫЯ ТО́ПІ (сапр. Р а м ч а н д р а П а н д у р а н г; каля 1814 — 18.4.1859), адзін з кіраўнікоў *Індыйскага народнага паўстання 1857—59*. Паплечнік і военачальнік Нана Сахіба — князя, правы якога як вярх. правіцеля маратхаў (гл. *Маратхскія княствы*) англічане не прызнавалі. Калі вясной 1857 Нана Сахіб далучыўся да антыбрыт. паўстання, Т.Т. ўзначаліў абарону г. Канпур. Пасля падзення ў ліп. 1857 Канпура ён сумесна з *Лакшмі-Баі* і інш. кіраўнікамі разгарнуў супраць англічан партыз. вайну. Восенню 1858 спрабаваў прарвацца ў Дэкан, але выдадзены здраднікам і пакараны смерцю.

ТАНУ́-АЛА́, Т а н у-О л а, хрыбет у гарах Паўд. Сібіры, на Пд Рэспублікі Тыва (Расія). Водападзел рэк бас. Енісея і бяссцёкавага воз. Убсу-Нур. Даўж. каля 300 км. Выш. да 3061 м. Складзены з

пясчанікаў, сланцаў, кангламератаў, эфузійна-асадкавых парод, гранітаў. Пераважае сярэднягорны рэльеф. На паўд. схілах да выш. 2000—2200 м — кедрава-лістоўнічная тайга, на паўднёвых — стэп; вышэй — горная тундра і каменныя россыпы.

ТАНФІ́ЛЬЕЎ Гаўрыла Іванавіч (6.3.1857, Талін — 4.9.1928), расійскі географ, батанік і глебазнавец, заснавальнік айчыннага *балотазнаўства*. Скончыў Пецярбургскі ун-т (1883). З 1885 у дэпартаменце земляробства, удзельнік шматлікіх экспедыцый па Расіі. З 1895 у Пецярбургскім бат. садзе і адначасова ў Пецярбургскім ун-це. З 1905 праф. Новарасійскага ун-та ў Адэсе. Навук. працы па геаграфіі (у т.л. «Геаграфія Расіі», т. 1—4, 1916—24), занальнасці расл. покрыва, балотах і тарфяніках Палесся, морах СССР. Развіваў ідэі В.В.*Дакучаева* аб прыродных зонах, прапанаваў схему фіз.-геагр. раянавання еўрап. ч. Расіі (1897) і ўсёй Расіі (1903). Яго імем названы адзін з Курыльскіх а-воў.

ТАНЦАВА́ЛЬНАЯ МУ́ЗЫКА, у шырокім сэнсе — музыка для суправаджэння *танца*, а таксама муз. творы, якія захоўваюць прыкметы танц. жанраў, але прызначаны для слухання; у вузкім сэнсе — *лёгкая музыка*, якая суправаджае *бытавыя танцы*, састаўная частка эстр. і джазавай музыкі. Для Т.м. характэрны дамінаванне метра, тыповыя рытмавыя формулы, акрэсленасць кадэнцый, перавага інстр. жанраў (не выключаецца і вакал).

Т.м. — адзін са стараж. відаў музыкі. Першапачаткова Т.м. — вакальная, а першыя муз. інструменты — ударныя; падзялялася на нар. і прафес. (палацавая, цырыманіяльная, тэатралізаваная). На працягу развіцця Т.м. і некат. муз. жанры ўплывалі адзін на адзін. Да Т.м. адносяцца творы прафес. аўтараў з самаст. маст. каштоўнасцямі, якія маюць жанрава-танц. аснову (вальсы і мазуркі Ф.Шапэна, «Славянскія танцы» А.Дворжака, «Арагонская хота» М.Глінкі). У гэтых творах элементы Т.м. спалучаюцца з танцавальнасцю як асаблівым эстэт. прынцыпам. У агульнамаст. плане танцавальнасць уласціва значнай колькасці твораў прафес. музыкі самых разнастайных жанраў. З 20 ст. Т.м. — найб. пашыраны від муз. мастацтва, што належыць да масавай культуры (гл. *Поп-музыка*). Сваёй папулярнасцю і уніфікаванасцю Т.м. абавязана сродкам масавай інфармацыі. Сярод традыц. і сучаснай Т.м. 20 ст. найб. папулярныя вальс, танга, рок-н-рол, брэйк-данс і інш.

Літ.: Ефименкова Б. Танцевальные жанры в творчестве замечательных композиторов прошлого и наших дней. М., 1962.

ТАНЦО́РКІ, сямейства двухкрылых насякомых; гл. *Таўкачыкі*.

ТАНША́НЬ, горад на Пн Кітая, на ПнУ Вял. Кітайскай раўніны, прав. Хэбэй. Каля 2 млн. ж. (2001). Чыг. ст., вузел аўтадарог. Цэнтр здабычы кам. вугалю (буйнейшае ў КНР радовішча Кайлуань). Прам-сць: металургічная, маш.-буд., цэм., шкляная, керамічная, лёгкая. Моцна пацярпеў ад землетрасення ў 1976.

ТА́О-КЛАРДЖЭ́ЦКАЕ КНЯ́СТВА, дзяржава ў паўд.-зах. Грузіі ў 9—10 ст. Заснавальнік — Ашот Багратыёні адбудаваў крэпасць і горад Артануджы (цяпер на тэр. Турцыі), які стаў сталіцай княства. Пры падтрымцы Візант. імперыі князі Багратыёні разгарнулі паспяховую барацьбу па выгнанні з Грузіі арабаў; у канцы 9 ст. яны прынялі тытул «цар грузін», а краіна атрымала назву Груз. царства. Найб. росквіту дзяржава дасягнула пры Давідзе III Курапалаце (пам. 1001). Яго прыёмны сын *Баграт III* у 975 абвешчаны царом аб'яднанай груз. дзяржавы, у якую ўвайшло і Т.-К.к.

ТАПАГРАФІ́ЧНАЯ ЗДЫ́МКА, сукупнасць работ па вызначэнні становішча характэрных пунктаў мясцовасці для атрымання графічнай ці аналітычнай яе мадэлі — *тапаграфічнай карты*. Падзяляецца на аэрафотатапагр., фотатэадалітную, мензульную і тахеаметрычную. Палявыя работы пры Т.з. ўключаюць: выпрацоўку планава-вышыннага аб-

ФРАГМЕНТ ТАПАГРАФІЧНАЙ КАРТЫ МАШТАБА 1:200 000



грунтавання на аснове геад. сетак (пракладка тэадалітных і нівелірных хадоў, мікратрыянгуляцыя, геадэзічныя засечкі), здымку характэрных пунктаў сітуацыі і рэльефу; камеральныя работы — вылічэнні, апрацоўку аэра- і фотатэадалітных здымкаў і пабудову арыгінала карты. Асн. Т.з. — аэрафотатапаграфічная, якая ўключае камбінаваную і *стэрэатапаграфічную здымку*. Камбінаваная здымка выконваецца мензульным спосабам на фотапланах, якія вырабляюць з аэраздымкаў. Гл. таксама *Аэрафотаздымка, Аэрафотатапаграфія, Тапаграфія*. *П.П.Явід.*

ТАПАГРАФІ́ЧНЫЯ КА́РТЫ, агульнагеаграфічныя карты дзяржавы, на якіх дэталёва адлюстроўваюцца размешчаныя на мясцовасці прыродныя і сац.-эканам. аб'екты, іх якасныя і колькасныя характарыстыкі. Падзяляюцца на аглядна-тапагр. (маштабы 1 : 500 000, 1 : 1 000 000), уласна тапагр. (1 : 5 000 — 1 : 200 000) і тапагр. планы (1 : 500, 1 : 1000, 1 : 2000). Сярод уласна Т.к. адрозніваюць буйнамаштабныя (1 : 5 000, 1 : 10 000), сярэднемаштабныя (1 : 25 000, 1 : 50 000) і дробнамаштабныя (1 : 100 000, 1 : 200 000). Да Т.к. адносяць таксама фота-, аэра-, космафатаграфічныя і лічбавыя (пераўтварэнне картаграфічнай інфармацыі з графічнай у лічбавую форму) карты.

Складаюць асобнымі лістамі, абмежаванымі мерыдыянамі і паралелямі, аб'яднанымі адзінай картаграфічнай праекцыяй (роўнавугольная папярочна-цыліндрычная Гаўса—Кругера), сістэмай разграфкі і наменклатуры (умоўнае абазначэнне лістоў) і ўмоўнымі знакамі. Праецыраванне зямной паверхні ажыццяўляецца на аснове дзярж. геад. сеткі па шасціградусных геад. зонах, кожная з якіх мае самаст. сістэму прамавугольных каардынат, што ў выглядзе кіламетровай квадратнай сеткі наносіцца на карты адносна іх восей — сярэдняга мерыдыяна зоны і экватара. На Т.к. *тапаграфічнымі ўмоўнымі знакамі* паказаны граніцы, гідраграфія, рэльеф, расл. покрыва, грунты, нас. пункты, шляхі зносін, прыродныя, прамысл., с.-г. і сац.-культ. аб'екты і інш. Т.к. ствараюцца і абнаўляюцца паводле матэрыялаў аэрафотатапагр. і касм. здымак, наземных мензульнай і тахеаметрычнай здымак. Выкарыстоўваюцца для арыентавання, дакладных вымярэнняў і разлікаў, складання агульнагеагр. і тэматычных карт, праектна-пошукавых і інш. геал. работ, ваен. справы і г.д. Гл. таксама *Аэрафотатапаграфія, Тапаграфічная здымка, Тапаграфія*.

П.П.Явід.

ТАПАГРАФІ́ЧНЫЯ ЎМО́ЎНЫЯ ЗНА́КІ, графічныя, каляровыя і шрыфтавыя абазначэнні для адлюстравання мясцовасці на *тапаграфічных картах*. Паказваюць становішча, форму і памеры аб'ектаў, іх якасныя і колькасныя характарыстыкі. На картах рознага маштабу яны маюць адзіную аснову паводле рысунка, колеру, шрыфтоў. Графічныя абазначэнні падзяляюцца на маштабныя (знешні контур аб'екта), пазамаштабныя (знакі ў выглядзе геам. фігур), лінейныя (для аб'ектаў лінейнай формы, напр., рэкі, дарогі, таксама горызанталі рэльефу) і тлумачальныя (дапаўняюць характарыстыку аб'ектаў). Шрыфтавыя надпісы перадаюць уласныя геагр. назвы, від, якасныя і колькасныя характарыстыкі аб'ектаў. *П.П.Явід.*

ТАПАГРА́ФІЯ (ад грэч. topos месца + *...графія*), навукова-тэхн. галіна *геадэзіі*, якая займаецца геам. вывучэннем мясцовасці. Асн. задачы Т.: распрацоўка метадаў стварэння *тапаграфічных карт* на падставе *тапаграфічных здымак*, іх класіфікацыі, зместу і дакладнасці, метадаў іх абнаўлення і інш.

Станаўленне Т. адносіцца да 16 ст. Наземныя тапаграфічныя здымкі (мензульная, тахеаметрычная) праводзяцца з 18 ст. пасля распрацоўкі метаду *трыянгуляцыі*. З 1-й пал. 20 ст. выкарыстоўваюцца матэрыялы *аэрафотаздымкі*, у 2-й пал. 20 ст. з'явілася *касмічная здымка* (гл. таксама *Аэракасмічныя метады*). Мензульная, тэадалітная і інш. здымкі выкарыстоўваюцца пераважна на невял. участках. Для сучаснага этапу развіцця Т. характэрна ўкараненне сродкаў аўтаматызацыі для тапагр. здымак з атрыманнем інфармацыі ў лічбавай форме, што дазваляе ствараць і абнаўляць карты, аўтаматызаваць працэсы падрыхтоўкі арыгіналаў і інш.

На Беларусі першыя вымярэнні зямельных плошчаў і складанне планаў адбыліся ў 2-й пал. 16 ст. — 1-й пал. 17 ст. пры правядзенні «Валочнай памеры». Навукова абгрунтаваныя тапографа-геад. работы пачаліся ў 1753 у *Віленскай астранамічнай абсерваторыі*. У 1816—21 на тэр. Віленскай, Гродзенскай, Мінскай і Віцебскай губ. створана апорная геад. сетка метадам трыянгуляцыі, на аснове якой рабіліся тапагр. здымкі ў маштабах 1: 21 000, 1 : 42 000 і 1 : 84 000. У 2-й пал. 20 ст. тэр. краіны закартаграфавана ў маштабе 1 : 10 000 (асобныя часткі — у буйнейшых). Тапографа-геад. работы выконваюць вытв. прадпрыемствы «Белгеадэзія» і «Космаэрагеадэзія» Камітэта па зямельных рэсурсах, геадэзіі і картаграфіі Рэспублікі Беларусь.

Літ.: Парамонов А.Г., Сомов В.Д., Черноглазов Н.В. Основы топографии и аэрофотосъемки. М., 1991; Топография с основами геодезии. М., 1986. *П.П.Явід.*

ТАПАГРА́ФІЯ ВАЕ́ННАЯ, галіна *тапаграфіі*, якая выкарыстоўваецца ў ваен. справе для атрымання інфармацыі аб мясцовасці ў інтарэсах баявой дзейнасці войск. Уключае: распрацоўку тэорыі і практыкі тапографа-геадэзічнага забеспячэння баявых дзеянняў, у т.л. арганізацыі і правядзення тапаграфічнага вывучэння тэрыторыі, стварэння і выкарыстання тапаграфічных карт, тапаграфічнага апісання мясцовасці, тапаграфічнага аналізу тэрыторыі.

УМОЎНЫЯ АБАЗНАЧЭННІ ТАПАГРАФІЧНЫХ КАРТ МАШТАБАЎ 1:25 000, 1:50 000 і 1:100 000

△171,8 ⛭159,7 Пункты дзяржаўнай геадэзічнай сеткі

НАСЕЛЕНЫЯ ПУНКТЫ І ІХ НАДПІСЫ

Асобныя будынкі

Жылыя і нежылыя будынкі

Дварыя, размешчаныя асобна

Цэрквы

Кварталы

з перавагай вогнеўстойлівых будынкаў

з перавагай нявогнеўстойлівых будынкаў

СНОЎ Гарады, у якіх ад 2 000 да 10 000 жыхароў

НОВЫ Пасёлкі гарадскога тыпу, у якіх менш за 2 000 жыхароў

Волкава Пасёлкі сельскага тыпу, у якіх ад 20 да 100 дамоў

Воранава Пасёлкі сельскага тыпу, у якіх да 20 дамоў

Заводы і фабрыкі

шах. вуг. Шахты і штольні дзеючыя

Склады гаручага

эл.-ст. Электрастанцыі

Радыёмачты і тэлевізійныя мачты

Збудаванні вежавага тыпу

Асабліва значныя помнікі

Могілкі

Лініі сувязі

Лініі электраперадачы

ДАРОЖНАЯ СЕТКА

Аднакалейныя чыгункі
а) Станцыі б) Платформы і раз'езды

а) Насыпы б) Выемкі (2–вышыня або глыбіня ў метрах)

Вузкакалейныя чыгункі

Удасканаленыя шашы: 13–шырыня пакрытай часткі, 17–шырыня дарогі ў метрах, А–матэрыял пакрыцця (А–асфальт)

Шаша. Трубы

Палепшаныя грунтавыя дарогі

Грунтавыя (прасёлачныя) дарогі

ГІДРАГРАФІЯ

Рэкі і ручаі

Азёры

Адзнакі ўрэзаў вады

Стрэлкі, якія паказваюць напрамак цячэння рэк (0,3–скорасць цячэння ў м/сек)

Характарыстыка рэк: 17–шырыня, 1,2–глыбіня ў метрах, П–характар грунту дна (пясчаны)

Масты
Характарыстыка мастоў: Д–матэрыял пабудовы, 30–даўжыня моста, 6–шырыня праезнай часткі ў метрах, 10–грузападымальнасць у тонах

Плаціны

РЭЛЬЕФ

а) Гарызанталі асноўныя патоўшчаныя
б) Гарызанталі асноўныя
в) Гарызанталі дадатковыя
г) Подпісы гарызанталей у метрах

·189 Адзнакі вышынь

170,0 Адзнакі вышынь каля арыенціраў

а) Курганы б) Ямы

Абрывы (5–вышыня ў метрах), яры, прамывіны

РАСЛІННАЕ ПОКРЫВА І ГРУНТЫ

а) Хвойныя лясы
б) Лісцевыя лясы
в) Мяшаныя лясы

Характарыстыка дрэвастою ў метрах: 16–вышыня дрэў, 0,30–таўшчыня, 5–адлегласць паміж дрэвамі

а) Буралому
б) Рэдкія лясы (рэдкалессе)

а) Высечаныя лясы
б) Гарэлыя і сухастойныя лясы

Прасекі ў лесе (4–шырыня прасекі ў метрах)

Хмызнякі: а) асобныя кусты
б) суцэльныя зараснікі

а) Лугавая расліннасць
б) Чаротавыя і трысняговыя зараснікі

Фруктовыя сады

а) Балоты непраходныя (1,7–глыбіня ў метрах)
б) Балоты праходныя

Скарачэнні на тапаграфічных картах:

бяр. бяроза *зерн.* зернесаўгас *кон.* конезавод Ніж. Ніжні *цукр.* цукровы завод сг. саўгас
Д драўляны К каменны *мук.* мукамольны раз. раз'езд СС сельсавет *шах.вуг.* шахта вугальная

зацыі і методыкі тапагр. падрыхтоўкі войск; вывучэнне тапагр. карт, аэраздымкаў і інш. дакументаў пра мясцовасць і іх выкарыстанне для кіравання войскамі; распрацоўку спосабаў і сродкаў разведкі мясцовасці, арыентавання і вымярэнняў пры падрыхтоўцы да баявых дзеянняў; складанне баявых графічных дакументаў і інш. Т.в. грунтуецца на дасягненнях геадэзіі, картаграфіі і асновах ваен. навукі. *П.П.Явід.*

ТАПАЖО́С (Tapajós), рака ў Бразіліі, правы прыток р. Амазонка. Утвараецца ад сутокаў рэк Журуэна і Тэліс-Пірыс (Сан-Мануэл), якія пачынаюцца на ўзв. Сера-дус-Парэсіс. Даўж. ад вытоку р. Журуэна 2200 км, пл. бас. 487 тыс. км^2. Цячэ па Бразільскім пласкагор'і, утварае парогі і вадаспады, ніжняе цячэнне па Амазонскай нізіне. Мнагаводная ад ліст. да сакавіка. Сярэдні расход вады 15,5 тыс. м^3/с. Суднаходная ад г. Сан-Луіс (300 км ад вусця). У вусці Т.—г. Сантарэн.

ТАПА́З (грэч. topazos, магчыма, ад назвы аднайм. в-ва ў Чырвоным м.; цяпер Сент-Джон), мінерал падкласа астраўных сілікатаў, $Al_2[SiO_4](OH, F)_2$. Мае да 17% фтору, прымесі жалеза, тытану, хрому, ванадыю і інш. Крышталізуецца ў рамбічнай сінганіі. Крышталі прызматычныя. Колер блакітны, фіялетавы, жоўты, аранжавы, ружовы, бясколерны, часта празрысты. Цв. 8. Шчыльн. 3,5 г/см^3. Паходжанне пнеўматаліта-гідратэрмальнае. Трапляецца ў гранітных пегматытах і грэйзенах; часта ў россыпах. Каштоўны камень. Радовішчы на Украіне, у Расіі, Бразіліі, Пакістане, Мадагаскары.



Тапаз.

ТАПАЛАГІ́ЧНАЯ А́ЛГЕБРА, раздзел *алгебры*, што вывучае розныя тапалагічныя сістэмы (групы, паўгрупы, кольцы, алгебры, вектарныя прасторы і інш.), якім нададзены *тапалогіі*, з неперарыўнымі алг. апераціямі ў дачыненні да гэтых сістэм. Асн. пытанні, якія разглядаюцца ў Т.а., — існаванне тапалогій у алг. сістэмах, што пераўтварае іх у тапалагічныя алг. сістэмы, прадаўжэнні тапалогій на пашырэнні алг. сістэм, уласцівасці тапалогій алг. сістэм, напр., магчымасць задання тапалогій з дапамогай метрыкі, нормы і інш.

ТАПАЛАГІ́ЧНАЯ ПРАСТО́РА, сукупнасць мноства, якое складаецца з элементаў адвольнай прыроды (пунктаў дадзенай прасторы), і *тапалогіі*, уведзенай у дадзенае мноства. Калі адсутнічае процілеглае, тапалогія лічыцца адкрытай.

Агульнасць паняцця Т.п. абмяжоўваецца ўмовамі, накладзенымі на лімітныя суадносіны (аксіёмы Т.п.), напр., зададзенае мноства T і пустое мноства-адкрытыя, аб'яднанне любога ліку адкрытых мностваў і перасячэнне любога канечнага ліку адкрытых мностваў таксама адкрытыя. Важны клас Т.п. ствараюць метрычныя прасторы, напр., лікавая прамая, n-мерная эўклідава і фукнцыянальная прасторы. Т.п. вывучаюцца тапалогіяй і выкарыстоўваюцца ў матэматыцы, з'яўляюцца асновай вызначэння паняццяў: мнагастайнасць, група Лі, рыманава прастора і інш.

ТАПАЛО́ГІЯ (ад грэч. topos месца + ...логія), раздзел матэматыкі, які вывучае ўласцівасці *тапалагічных прастораў* і розных падмностваў (фігур) у гэтых прасторах. Уласцівасці фігуры наз. тапалагічнымі, калі яны захоўваюцца пры тапалагічных адлюстраваннях. Напр., тапалагічныя ўласцівасці: замкнёнасць лініі, наяўнасць краю ў паверхні і інш.

Асновы Т. закладзены Л.*Эйлерам*, Ж.А.*Пуанкарэ*, Ф.Гаўсдорфам. Значны ўклад у развіццё Т. зрабілі рус. матэматыкі П.С.*Аляксандраў*, С.П.*Новікаў*, Л.С.*Пантрагін*, П.С.Урысон і інш. Напач. Т. вывучала тапалагічныя ўласцівасці фігур, пазней — адвольныя неперарыўныя адлюстраванні. Адна з асн. задач Т. — класіфікацыя неперарыўных адлюстраванняў і вылучэнне з іх класаў з патрэбнымі ўласцівасцямі, напр., з уласцівасцю мець нерухомы пункт. У Т. вылучаюць самастойныя кірункі, якія адрозніваюцца аб'ектам і метадам даследаванняў. Агульнай Т. вывучаюць звязнасць, кампактнасць, метрызавальнасць тапалагічных прастораў, а таксама зменнасць гэтых паняццяў пры неперарыўных адлюстраваннях прастораў. Разам з *алгебрай* агульная Т. з'яўляецца асновай тэарэтыка-мноствавых метадаў у матэматыцы. *Алгебраічная тапалогія* звязана з вывучэннем тапалагічных прастораў і іх неперарыўных адлюстраванняў з дапамогай алг. аб'ектаў (*гомамарфізмаў, груп, кольцаў*). Дыферэнцыяльная Т. вывучае алг. мнагастайнасці (гл. *Алгебраічная геаметрыя*) сродкамі матэм. аналізу і алг. Т.; кускова-лінейная Т. —, паліэдры (*мнагагранні*) і іх кускова-лінейныя адлюстраванні.

Літ.: Александрян Р.А., Мирзаханян Э.А. Общая топология. М., 1979; Фоменко А.Т., Фукс Д.Б. Курс гомотопической топологии. М., 1989; Топология. Мн., 1990. *В.І.Вядзернікаў, А.С.Фядзенка.*

ТАПАНІ́МІКА (ад грэч. topos месца + onyma імя, назва), раздзел *анамастыкі*, які вывучае ўласныя назвы геагр. аб'ектаў (тапонімы), заканамернасці іх узнікнення, развіцця, ужывання, пашырэння, значэнне і структуру, таксама пытанні напісання тапонімаў і перадачы іх з адной мовы на іншую. Падзяляецца на агульную і рэгіянальную Т. (даследуе тапанімію — геагр. назвы на пэўнай тэрыторыі, якія ўключаюць айконімы — назвы паселішчаў, гідронімы — назвы рэк, азёр, мікратапонімы — назвы ўрочышчаў і інш.). Цесна звязана з мовазнаўствам, гісторыяй, этнаграфіяй, картаграфіяй, тапаграфіяй, геаграфіяй, геалогіяй, дэмаграфіяй і інш.

Вылучылася ў самаст. навуку ў пач. 20 ст. Вялікі ўклад у развіццё Т. зрабілі вучоныя: К.*Буга*, А.І.*Сабалеўскі*, А.А.*Шахматаў*, бел. З.Я.Тараноўскі і Ю.Ю.Трусман.

На Беларусі даследаванне геагр. назваў пачалося ў 1-й пал. 19 ст. У 1830—90-я г. тлумачылі сэнс асобных бел. тапонімаў П.М.*Шпілеўскі*, А.Г.К.*Кіркор*, І.В.Турчыновіч; вывучалі гадранімію ў сувязі з даследаваннем стараж. рассялення славян і балтаў А.А.Качубінскі, І.Я.Спрогіс, А.Л.Пагодзін. Найб. інтэнсіўна развіваецца з 1960—70-х г. 1—3.12.1967 у Мінску адбылася 1-я бел. тапанімічная канферэнцыя. Даследаваны: геаграфія асн. бел. айканімічных тыпаў, выкарыстанне розных метадаў пры вывучэнні геагр. назваў і інш. Праведзена сістэматызацыя тапонімаў, вывучана іх структура (тапанімічныя асновы і словаўтваральныя сродкі), выяўлены балцкія элементы ў бел. геагр. назвах, паказана фарміраванне назваў паселішчаў у гіст. плане. Складзены слоўнікі назваў нас. пунктаў па абласцях (Я.Н.Рапановіч). Уклад у развіццё бел. Т. зрабілі М.В.*Бірыла*, В.А.*Жучкевіч*, В.П.*Лемцюгова*. Найб. распрацаваны гідраніміка, айканіміка, мікратапаніміка. Праводзіцца стандартызацыя тапонімаў краіны. Дзейнічаюць тапанімічныя камісіі пры Нац. АН Беларусі (з 1991) і пры Савеце Міністраў (з 1998).

Літ.: Бірыла М.В., Ванагас А.П. Літоўскія элементы ў беларускай анамастыцы. Мн., 1968; Жучкевич В.А. Общая топонимика. 3 изд. Мн., 1980; Яго ж. Краткий топонимический словарь Белоруссии. Мн., 1974; Адамовіч Я.М. Мікратапанімічныя назвы. Мн., 1971; Яшкін І.Я. Беларускія геаграфічныя назвы. Мн., 1971; Лемцюгова В.П. Беларуская айканімія. Мн., 1970; Яе ж. Восточнославянская ойконимия апеллятивного происхождения. Мн., 1983; Мікратапанімія Беларусі: Матэрыялы. Мн., 1974; Рылюк Г.Я. Истоки географических названий Беларуси: (С основами общей топонимики). 2 изд. Мн., 1999. *А.М.Грыгор'ева, Г.Я.Рылюк.*

ТАПАРКО́Ў Васіль Восіпавіч (16.3.1889, С.-Пецярбург — 25.8.1970), расійскі акцёр, педагог. Нар. арт. СССР (1948). Д-р мастацтвазнаўства (1965). Скончыў Пецярбургскае тэатр. вучылішча (1909). Працаваў у т-рах Пецярбурга і Масквы, з 1927 у Маскоўскім Маст. акад. т-ры. Выкладаў у Школе-студыі імя У.Неміровіча-Данчанкі (з 1948 праф.). Валодаў майстэрствам пераўвасаблення, імкнуўся да вастрыні і выразнасці сцэн. малюнка, тонкі псіхалагізм спалучаў з глыбокай эмац. насычанасцю. Сярод роляў: Чычыкаў («Мёртвыя душы» паводле М.Гогаля), Кругасветлаў («Плады асветніцтва» Л.Талстога), Мышлаеўскі («Дні Турбіных» М.Булгакава), Морыс («Глыбокая разведка» А.Крона), Аргон («Тарцюф» Мальера) і інш. Аўтар кніг і

артыкулаў аб вучэнні Станіслаўскага. Дзярж. прэміі СССР 1946, 1952.

Літ.: Рогачевский М.Л. В.О.Топорков. М., 1969.



М.**Тапівалдыеў**.

ТАПАХІМІ́ЧНЫЯ РЭА́КЦЫІ, клас *рэакцый хімічных*, што адбываюцца ў цвёрдай фазе і лакалізаваны на паверхні падзелу фаз цвёрдых зыходных рэчываў і прадукту рэакцыі.

Пры Т.р. у адрозненне ад інш. гэтэрагенных працэсаў паверхня падзелу фаз узнікае ў выніку самой рэакцыі і мяняецца ў часе, таму яны звычайна з'яўляюцца нестацыянарнымі. Т.р. пашыраны ў прыродзе (*выветрывание*, ператварэнне мінералаў). Тыповыя Т.р. — *абпал*, хім. траўленне. На Т.р. заснаваны аднаўленне металаў з руд, прамысл. атрыманне буд. і паўправадніковых матэрыялаў.

Літ.: Розовский А.Я. Кинетика топохимических реакций. М., 1974; Продан Е.А. Топохимия кристаллов. Мн., 1990.

ТАПВО́ЗЕРА, возера на ПнЗ еўрап. ч. Расіі, у Карэліі. Пл. 986 км^2, глыб. да 56 м. Берагі парэзаныя; шмат астравоў. Выцякае р. Коўда. Ледастаў з кастр. да мая. Са стварэннем Кумскай ГЭС (1966) стала часткай *Кумскага вадасховішча*. Рыбалоўства.

ТАПЁР (франц. tapeur ад taper ліпар. — стукаць), 1) піяніст, які іграў за плату на балях, у танц. і гімнастычных залах і інш. або суправаджаў сваёй ігрою паказ нямога кіно. 2) У пераносным сэнсе — піяніст, які іграе механічна.

ТАПІВАЛДЫ́ЕЎ Мамадалі (20.9.1919, кішлак Пандыган Рыштанскага р-на Ферганскай вобл., Узбекістан — 7.5.1969), удзельнік партыз. руху на Беларусі ў Вял. Айч. вайну, Герой Сав. Саюза (1944). У Вял. Айч. вайну з 1941 на Зах. фронце; трапіў у палон, пасля ўцёкаў у партызанах: камандзір аддз. разведкі атрада, які дзейнічаў на тэр. Віцебскай і Магілёўскай абл. У 1944 Т. з аддзяленнем абяззброіў ням.-фаш. гарнізон. Пасля вайны старшыня калгасаў.

ТАПІ́ЛАЎСКАЕ БАЛО́ТА. Вярховага (60%), нізіннага (20%), мяшанага (10%) і пераходнага (10%) тыпаў на ПдЗ Лельчыцкага р-на Гомельскай вобл., у вадазборы р. Сцвіга. Пл. 11 тыс. га, у межах прамысл. пакладу торфу 6,2 тыс. га. Глыб. торфу да 5,8 м, сярэдняя 2,1 м. Запасы торфу каля 19,2 млн. т (здабываецца на ўгнаенне). Балота ўваходзіць у склад Палескай базы бітумнай сыравіны. Каля 500 га асушана, выкарыстоўваецца пад сенажаць. На неасушанай тэр. хваёвы лес, хмызнякі, месцамі асокі, чарот, трыснёг. На балоце біял. заказнік *Букчанскі*.

ТАПІ́ЛІН Ігар Васілевіч (н. 22.7.1947, г. Краснадар, Расія), бел. мастак. Скончыў Усесаюзны дзярж. ін-т кінематаграфіі ў Маскве (1973). З 1973 мастак-пастаноўшчык на кінастудыі «Беларусьфільм». Афарміў кінафільмы «Пра чырвоную шапачку» (1975), «Прыміце тэлеграму ў доўг» (1976), «Чалавек, які браў інтэрв'ю» (1986), «Маці Урагану» (1994), «Сівая легенда» (1995), «Кааператоры Палітбюро» (1996), «Бабін Яр» (2001). Сярод жывапісных работ: «Нацюрморт» (1991), «Парк» (1993), «Трафарэты» (1995), «Пасьянс» і «Юдзіф і Алаферн» (абедзве 1997), «Адпачынак» (1998), «Правінцыяльны горад» (2000).



І.**Тапілін**. Нацюрморт. 1991.

ТАПІ́ЛІШКАЎСКІЯ ВАЛУНЫ́, геалагічны помнік прыроды рэсп. значэння (з 1994). 3 валуны размешчаны на паўд. ускраіне в. Тапілішкі Шчучынскага р-на Гродзенскай вобл. Шаравата-ружовы буйназярністы граніта-гнейс даўж. 3,7 м, шыр. 3,1 м, выш. 1,3 м, у абводзе 10,1 м, аб'ём 8 м^3, маса 21 т. Шэры гнейс даўж. 3,7 м, шыр. 2,6 м, выш. 1 м, у абводзе 9,7 м, аб'ём 5,1 м^3, маса 13,5 т. Ружавата-буры граніт рапаківі з крышталямі палявога шпату (авоіды 2—5 см) даўж. 3,7 м, шыр. 2,9 м, выш. 1,3 м, у абводзе 9,8 м, аб'ём 7,4 м^3, маса 20 т. Прынесены ледавіком каля 200 тыс. гадоў назад з Пд Фінляндыі. *В.Ф.Вінакураў.*

ТАПІ́ЛІШКІ, вёска ў Шчучынскім с/с Шчучынскага р-на Гродзенскай вобл., на аўтадарозе Шчучын—Астрына. Цэнтр раённага унітарнага с.-г. вытв. прадпрыемства. За 4 км на Пн ад г. Шчучын, 65 км ад Гродна, 11 км ад чыг. ст. Ражанка. 876 ж., 281 двор (2002). Дом культуры, б-ка. Каля вёскі геал. помнік прыроды *Тапілішкаўскія валуны*.

ТАПІНАМБУ́Р, земляная груша, сланечнік клубняносны (Helianthus tuberosus), кветкавая расліна сям. складанакветных. Радзіма — Паўн. Амерыка. У Еўропе з 17 ст. На Беларусі вырошчваецца як кармавая расліна, часам дзічэе.

Шматгадовая травяністая расліна. Сцёблы прамыя, моцныя, аблісцелыя, апушаныя,



Тапінамбур.

выш. да 3 м. Лісце зубчастае, яйцападобнае, чаранковае, апушанае. Жоўтыя суквецці — кошыкі дыяметрам 6—10 см. Плод — сямянка. Клубні (белыя, жоўтыя, фіялетавыя, чырв.) груша- або яйцападобныя, на кароткіх сталонах, скучаныя каля асновы сцябла. Маюць у сабе інулін, аскарбінавую к-ту, вітаміны групы В, каратын, мінер. рэчывы. Спажываюцца ў ежу, выкарыстоўваюцца для атрымання спірту, фруктозы. Харч., тэхн., кармавая, лек. расліна. *В.М.Прохараў.*

ТАПІНО́МЫ (Tapinoma), род насякомых сям. мурашак атр. перапончатакрылых. Пашыраны ўсюды, акрамя палярных абласцей. Жывуць у розных ландшафтах, трапляюцца ў жыллі чалавека. Мурашнікі размяшчаюцца ў глебе, пад камянямі на прагравальных месцах: узгорках, палянах і інш. Найб. шматлікія віды Т.: пахучая, або мурашка блукаючая (T. erraticum), чорнагаловая (T. melanocephalum), сесіле (T. sessile) і інш. На Беларусі 2 віды; Т. няясная, або мурашка цёмная (T. ambiguum), — у Чырв. кнізе.

Даўж. Т. няяснай: самкі да 6 мм, самца да 5 мм, рабочай асобіны — да 3,5 мм. Сям'я складаецца з 20—30 самак і прыкладна 1,5 тыс. рабочых асобін. Афарбоўка чорная, цёмна-бурая. 1-ы сегмент брушка без лускавінкі (сістэмат. адзнака). Усёедныя. *С.Л.Максімава.*



Тапінома няясная: 1 — самка; 2 — рабочая асобіна.

ТАПІ́РЫ, тапіравыя (Tapiridae), сямейства млекакормячых атр. няпарнакапытных. 5 вымерлых і 1 сучасны род, 4 віды: Т. горны (Tapirus pinchaque), Т. цэнтральнаамерыканскі (T. bairdi), чапрачны, або індыйскі (T. indicus), — занесеныя ў Чырв. кнігу МСАП, і Т. раўнінны (T. terrestris). Пашыраны ў Цэнтр. і Паўд. Амерыцы і Паўд.-Усх. Азіі. Жывуць у забалочаных лясах, хмызняковых зараснікаў.

Даўж. да 2 м, выш. ў карку да 1,2 м; маса да 300 кг. Тулава масіўнае. Морда заканчваецца невял. хабатком. Вочы маленькія. Ногі кароткія, тоўстыя, на пярэдніх па 4, на задніх па 3 пальцы. Скура тоўстая, з кароткімі цёмна-бурымі валасамі. Расліннаедныя. Нараджаюць 1, зрэдку 2 дзіцянят у сярэднім раз за 15 мес. Лёгка прыручаюцца. *Э.Р.Самусенка.*

ТАПО́ЛЬСКАЯ (Topolska, сапр. Пяховяк, Piechowiak) Марыя Барбара (н. 21.5.1938, в. Кажмінак Велікапольскага ваяв., Польшча), польскі гісторык. Д-р габілітаваны (1984). Скончыла ун-т імя А.Міцкевіча ў Познані (1960). У 1973—76 ад'юнкт у Вышэйшай пед. школе пры ун-це ў Познані. З 1978 у Аддзяленні па вывучэнні замежнай Палоніі ў Познані (з 1992 Аддзяленне па вывучэнні нацыянальнасцей Польскай АН). З 1997 надзвычайны прафесар Ін-та гісторыі Вышэйшай пед. школы ў Зялёна-Гуры. Вывучае гісторыю культуры літ. і бел. зямель 15—20 ст., гісторыю Вял. Польшчы, праблемы этнічнай гісторыі, культуру польск. эміграцыі. Аўтар кн. «Шклоўскі маёнтак ва ўсходняй Беларусі ў XVII і XVIII ст.» (1969), «Чытач і кніга ў Вялікім княстве Літоўскім у эпоху Рэнесансу і барока» (1984) і інш.



Тапіры: 1 — цэнтральнаамерыканскі (асобна — падэшва пярэдняй нагі); 2 — чапрачны.

ТАПО́ЛЯ (Populus), род кветкавых раслін сям. вярбовых. Каля 110 відаў. Пашыраны ў Паўн. паўшар'і. Растуць у прырэчных і горных лясах, утвараюць невял. гаі. На Беларусі 3 віды Т.: белая, або серабрыстая (P. alba), дрыжачая, або *асіна*, і чорная, або ясакар (H. nigra). У культуру ўведзена каля 30 відаў, форм і гібрыдаў. Найб. вядомыя Т.: бальзамічная (P. balsamifera), духмяная (P. suaveolens), дэльтападобная (P. deltoides), канадская (P. canadensis), пірамідальная (P. pyramidalis) і інш.

Лістападныя, двухдомныя, ветраапыляльныя дрэвы выш. 30—45 (60) м. Жывуць да 150 гадоў. Крона шатра-, яйцападобная ці пірамідальная. Лісце чаргаванае, чаранковае, суцэльнае, залозіста-зубчастае або лопасцевае. Цвітуць пераважна да распускання лісця. Кветкі ў павіслых цыліндрычных каташках даўж. 3—15 см. Плод — каробачка. Драўніна лёгкая, белая, мяккая, выкарыстоўваецца ў папяровай, фанернай, мэблевай, запалкавай выт-сцях, кара — для вырабу і афарбоўкі скур у жоўты колер. Дэкар., тэхн., лек. расліны. *І.М.Гарановіч.*



Таполя чорная.

ТАПТУ́ХА, традыцыйная рыбалоўная прылада славян; рухомая пастка. Лакальныя бел. назвы таптун, кош, баўтуха, сетка. На Беларусі бытавалі некалькі відаў: з прутоў (відаць, найб. старажытная), сеткавая на драўляным каркасе, сеткавая на абручах. Плеценая з прутоў Т. ўяўляла сабой кош у форме паўконуса, часта мела палку-ручку ці вяроўку, што мацавалася ў 2 месцах да абруча. Сеткавая на драўляным каркасе формаю падобна да плеценай. Каркас складаўся з уваходнага паўкруглага абруча і прымацаваных да яго прутоў, канцы якіх сыходзіліся. Сеткавая на абручах Т. найб. дасканалая па канструкцыі і больш зручная ў эксплуатацыі. Яе каркас складалі толькі абручы: першы ў форме паўкруга, наступныя 4—6 — круглыя (пры набліжэнні да глухога канца сеткавага мяшка іх памеры паменшаліся). Пастаянная форма снасці захоўвалася з дапамогай дугападобнай ручкі, адзін канец якой прымацоўвалі да ўваходнага абруча, другі — да глухога канца сеткавага мяшка. Рыбачылі Т. у зарослых месцах вадаёмаў: прытаплялі да дна і, боўтаючы нагамі ці шастом, заганялі рыбу ў пастку. Плеценая і сеткавая на абручах Т. характэрна для Палесся. У некат. мясцовасцях называлі *сак*. У наш час лоўля Т. забаронена.

І.М.Браім.

ТА́ПТЫ, рака ў Індыі. Даўж. 720 км, пл. бас. 88 тыс. км^2. Вытокі ў гарах Сатпура, цячэ ў глыбокай даліне па паўн.-зах. ч. Дэканскага пласкагор'я, упадае ў Камбейскі зал. Аравійскага м., утварае эстуарый. Рэжым мусонны. Сярэдні расход вады каля 650 м^3/с. Выкарыстоўваецца для арашэння. Суднаходная на 50 км ад вусця. На Т. — г. Бурханпур, у эстуарыі — марскі порт Сурат.

ТАПУРЫ́ДЗЕ Валянцін Багратавіч (13.1.1908, Тбілісі — 1980), грузінскі скульптар. Нар. мастак Грузіі (1958). Правадз. чл. АМ СССР (1970). Скончыў Тбіліскую АМ (1931). Аўтар манум., эпічных па вобразным ладзе твораў: фігура «Перамога» і статуя А.Цэрэтэлі на франтоне т-ра ў Чыятуры (1945—50), помнікі У.Леніну ў Тбілісі (1956), Калінінградзе (1958), Руставі (1961) і інш. Працаваў таксама ў жанры партрэта



В.Тапурыдзе. Перамога. Фігура на будынку Грузінскага драматычнага тэатра імя А.Цэрэтэлі ў г. Чыятуры. 1950.

(«Акцёр Э.Буш», 1966, і інш.). Дзярж. прэмія СССР 1958.

ТАПЧЭ́ЎСКІ Фелікс Феліксавіч [літ. псеўд. Хвэлька з Рукшэніц; каля 1838, б. фальварак Будзішча (Лёсава) Ушацкага р-на Віцебскай вобл. — 29.12.1892], бел. паэт-дэмакрат. Скончыў Лепельскае дваранскае вучылішча. Працаваў у канцылярыі Віцебскага земскага суда. У 1864 арыштаваны за сувязь з паўстанцамі 1863—64, з-за недаказанасці выпушчаны. Працаваў управаўляючым у маёнтку Ухвішча (Полацкі р-н). Яго гумарыст. творы распаўсюджваліся ў рукапісах. Вершы «Саўсім не тое, што было», «Грошы і праца», «Ён і яна», «Вечарынка», «Панскае ігрышча» (прыпісваўся і А.Гурыновічу) збераглісяў рукапіснай «Беларускай хрэстаматыі» Б.І.Эпімах-Шыпілы. Дэмакратызм Т. выяўляўся праз тыпова сялянскае светабачанне лірычнага героя яго вершаў — назіральнага, дасціпнага, які высока цэніць чалавека працы, асуджае бурж. адносіны ў грамадстве, высмейвае шляхецкую культуру, але застаецца ў палоне патрыярхальных уяўленняў.

Тв.: У кн.: Беларуская літаратура XIX ст.: Хрэстаматыя. Мн., 1988.

Літ.: Л о й к а А.А. Гісторыя беларускай літаратуры. Дакастрычніцкі перыяд. Ч. 1. 2 выд. Мн., 1989; К а х а н о ў с к і Г. Адчыніся, таямніца часу. Мн., 1984. С. 86—93; Пачынальнікі. Мн., 1977. С. 378—380.

У.І.Мархель.

ТАР, Т х а р, пустынная і паўпустынная вобласць у Індыі і Пакістане. Распасціраецца ўздоўж левабярэжжа ніжняга цячэння р. Інд на 850 км. Пл. каля 300 тыс. км^2. Пераважаюць выш. 100—200 м. Укрытыя расліннасцю пясчаныя грады, дзюны, барханы, вял. ўчасткі пяскоў. У маі—чэрв. моцныя вятры і пылавыя буры. Астанцовыя ўзвышшы складзены з пясчанікаў, гранітаў, кварцытаў. У паніжэннях — саланчакі, такыры, салёныя азёры. Разрэджаная кустовая расліннасць. Пашавая жывёлагадоўля. У аазісах і ў даліне р. Інд — арашальнае земляробства.

ТА́РА, рака ў Расіі, правы прыток р. Іртыш (бас. р. Об). Даўж. 806 км, пл. бас. 18,3 тыс. км^2. Цячэ па Васюганскай раўніне. Асн. прытокі: Чэка, Майзас (справа). Сярэдні расход вады каля г.п. Мурамцава 39,1 м^3/с. Суднаходная на 325 км ад вусця. Сплаўная.

ТА́РА (італьян. tara ад араб. тарха — тое, што адкінута), ёмістасць для захоўвання, упакоўкі і транспарціроўкі прадуктаў і тавараў. Адрозніваюць Т. цвёрдую (бочкі, бітоны, скрынкі, бутэлькі), паўцвёрдую (кошыкі, кардонныя скрынкі) і мяккую (мяшкі); разавую і шматабаротную, якую, як правіла, належыць вяртаць пастаўшчыку (вытворцу) або здаваць таразбіральным арг-цыям; буйнагабарытную і малагабарытную; разборную, неразборную, складную; герметычную і негерметычную. Кошт Т. ўключаецца (цалкам ці часткова) у цану тавару. Закладная цана за Т. спаганяецца, калі гэта прадугледжваецца прэйскурантам ці ўмовамі пастаўкі. Парадак і тэрміны вяртання Т. вызначаюцца адпаведнымі інструкцыямі або дагаворам.

ТАРАЗЭ́ВІЧ Георгій Станіслававіч (н. 17.7.1937, в. Слабада Мядзельскага р-на Мінскай вобл.), дзяржаўны і парт. дзеяч Беларусі. Канд. тэхн. н. (1969). Скончыў Львоўскі політэхн. ін-т (1959), Акадэмію грамадскіх навук пры ЦК КПСС (1987). З 1959 інжынер-геадэзіст, выкладчык Бел. ін-та інжынераў чыг. транспарту. З 1969 нач. Бел. картаграфічнага геад. прадпрыемства. У 1974—79 1-ы сакратар Савецкага райкома КПБ г. Мінск, 2-і сакратар Мінскага гаркома партыі. З 1980 старшыня Мінскага гарвыканкома, з 1983 1-ы сакратар Мінскага гаркома КПБ. У 1985—89 Старшыня Прэзідыума Вярх. Савета БССР. У 1989—91 старшыня камісій Вярх. Савета СССР. З 1991 старшыня К-та па геадэзіі пры СМ Рэспублікі Беларусь, з 1993 1-ы нам. міністра замежных спраў Рэспублікі Беларусь, у 1994—95 надзвычайны і паўнамоцны пасол Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Польшча.



Таптухі.

Чл. ЦК КПБ у 1974—91, ЦК КПСС у 1986—91. Дэп. Вярх. Савета БССР у 1980—90, Вярх. Савета СССР у 1985—89. Нар. дэп. СССР у 1989—91.

ТАРАКА́Н РЫ́ЖЫ, насякомае атр. тараканавых, гл. *Прусак*.

ТАРАКА́НАВА Лізавета (псеўд.; вядома пад імёнамі Франк, Шаль Трэмуйль, Алі Эметэ, прынцэса Уладзімірская, княгіня Пінеберг, Зялінская і інш.; каля 1745—15.12.1775), авантурыстка-самазванка, якая выдавала сябе за дачку рас. імператрыцы *Лізаветы Пятроўны* і графа А.Р.*Разумоўскага* Аўгусту Аляксееўну Тараканаву, што ў 1785 паводле загаду *Кацярыны II* зняволена ў Іванаўскі манастыр у Маскве. У 1772 Т. абвясціла сябе ў Парыжы прэтэндэнткай на рас. прастол. У 1775 падманам арыштавана ў Італіі, прывезена ў Расію і зняволена ў Петрапаўлаўскай крэпасці, дзе памерла ад сухотаў. Паданне пра гібель Т. у час паводкі 1777 (сюжэт карціны К.Дз.Флавіцкага, 1864) не адпавядае рэчаіснасці.

Літ.: Мельников П.И. Княжна Тараканова и принцесса Владимирская // Собр. соч. М., 1976. Т. 8; Лунинский Э. Княжна Тараканова: Пер. с пол. М., 1991 [рэпр. выд.: М., 1909].

ТАРАКА́НАВЫЯ, тараканы (Blattoptera, або Blattodea), атрад насякомых. Вядомы з карбону (каля 350 млн. г. назад). Больш за 3,6 тыс. відаў. Пашыраны ўсюды, пераважна ў тропіках і субтропіках. Жывуць пад камянямі, у расл. подсціле, глебе, норах грызуноў, некат. віды: *прусак*, чорны таракан (Blatta orientalis) і інш. — у жыллі чалавека. Пашкоджваюць харч. прадукты, скураныя вырабы і інш. Пераносчыкі ўзбуджальнікаў хвароб (напр., дызентэрыі) і яец гельмінтаў. На Беларусі 6 відаў (прусак, чорны, лапландскі тараканы і інш.).

Даўж. да 9,5 см. Цела пляскатае, авальнае. Вусікі доўгія, шматчленікавыя, шчацінкападобныя. Пярэднія крылы ператвораны ў шчыльныя надкрылы, заднія тонкія, перапончатыя, схаваныя пад надкрыламі; у некат. відаў надкрылы і крылы адсутнічаюць. Ногі бегальныя з 5-членікавымі лапкамі. Брушка падоўжанае, 8—10-членікавае. Ротавыя органы грызучыя. Усёедныя. Развіццё з няпоўным ператварэннем. Лічынкі развіваюцца ад 3—4 мес да 4 гадоў. Некат. трапічныя віды жывародныя. *С.Л.Максімава.*

ТАРАКІ́ Нур Мухамед (14.7.1917, прав. Газні. Афганістан — 8.10.1979), дзяржаўны і паліт. дзеяч Афганістана. З канца 1930-х г. журналіст, аўтар празаічных і паэтычных твораў. З канца 1940-х г. у грамадска-паліт. руху «Віш зальміян» («Абуджаная моладзь»). На ўстаноўчым з'ездзе *Народна-дэмакратычнай партыі Афганістана* (НДПА) у 1965 абраны яе ген. сакратаром. Пасля расколу НДПА у 1967 узначаліў яе фракцыю «Хальк», з 1977 — зноў ген. сакратар аб'яднанай НДПА. Арышт Т. і яго паплечнікаў выклікаў 27.4.1978 паўстанне кабульскага гарнізона, якое скінула рэжым М.*Дауда* і прывяло да ўлады НДПА. З мая 1978 Т. — старшыня Рэв. савета Дэмакр. Рэспублікі Афганістан, адначасова яе прэм'ер-міністр. Спроба адхіліць ад пасады свайго намесніка ў партыі і ўрадзе Х.*Аміна* ў вер. 1979 скончылася арыштам Т. і яго забойствам у турме.

Тв.: Рус. пер. — Повести: Сб. М., 1987.

ТАРА́Н (Rutilus rutilus heckeli), рыба сям. карпавых, падвід *плоткі*. Жыве ў апрэсненых участках Чорнага і Азоўскага мораў. Паўпрахадная, чародная рыба.

Даўж. да 50 см, маса да 1 кг. Канцы грудных, брушных і анальнага плаўнікоў цёмныя. Рот ніжні. Корміцца малюскамі і ракападобнымі. На нераст вясной заходзіць у рэкі Дон, Дняпро, Днестр, Дунай, Кубань. Аб'ект промыслу.



Таран.

ТАРА́Н (польск. taran ад італьян. taranto), 1) старажытная аблогавая прылада, якая выкарыстоўвалася для разбурэння крапасных сцен, вежаў і брам. Уяўляў сабой бервяно з жалезным або бронзавым наканечнікам, якое падвешвалася на канатах (ланцугах) у драўлянай рухомай вежы, што перамяшчалася на калёсах і служыла прыкрыццём для людзей, якія абслугоўвалі Т. (гл. таксама *Аблогавая тэхніка*). 2) Тэхнічнае збудаванне для пад'ёму вады (Т. гідраўлічны). *С.В.Папоў.*

ТАРА́Н, прыём, які выкарыстоўваўся ў паветр., танк. і марскім баях. Паветр. Т. — удар фюзеляжам, крылом або лопасцямі вінта самалёта ў паветр. баі па самалёце праціўніка. Першы паветр. Т. здзейсніў рас. лётчык П.М.*Нясцераў* у 1-ю сусв. вайну. У першы дзень Вял. Айч. вайны лётчык-знішчальнік П.С.Рабцаў тараніў ням. самалёт у небе над Брэстам. Начны Т. упершыню здзейсніў лётчык-знішчальнік В.В.*Талалі́хін* на подступах да Масквы (жн. 1941). Беларус Б.І.*Коўзан* стаў адзіным



Г.С.**Таразевіч**.



П.А.**Таран**.

у свеце лётчыкам, які тараніў 4 самалёты праціўніка. У гады 2-й сусв. вайны лётчыкі наносілі таксама таранныя ўдары па варожых караблях, калонах з тэхнікай (напр., подзвіг экіпажа самалёта М.Ф.*Гастэлы* і інш.). Танкавы Т. — удар корпусам танка па борце або карме танка (бронемашыны) праціўніка. Прымяняўся ў выключных выпадках, калі не было магчымасці інш. спосабам знішчыць танк праціўніка. Марскі Т. (таранны ўдар) — удар спец. выступам насавой падводнай часткі карабля (таранам) у борт варожага карабля з мэтай яго затаплення. Выкарыстоўваўся ў вяслярным, ветразева-вяслярным, пазней (у 2-й пал. 19 ст.) у браняносным флоце; у 20 ст. — зрэдку надводнымі караблямі супраць падводных лодак і інш. *С.В.Папоў.*

ТАРА́Н Павел Андрэевіч (н. 18.10.1916, с. Шолахава Нікапальскага р-на Днепрапятроўскай вобл., Украіна), ваенны лётчык. Двойчы Герой Сав. Саюза



Да арт. **Тараканавыя**. Тараканы: 1 — чорны; 2 — лапландскі; 3 — плямісты; 4 — горны (а — самец; б — самка).

(1942, 1944). Ген.-лейт. авіяцыі (1967). Скончыў Качынскую ваен. авіяц. школу лётчыкаў (1938), Ваен. акадэмію Генштаба (1958). У Чырв. Арміі з 1937. Удзельнік паходу ў Зах. Украіну (1939), сав.-фінл. вайны 1939—40. У Вял. Айч. вайну камандзір звяна, эскадрыллі, бамбардзіровачнага авіяпалка. Ваяваў на Украіне, у Прыбалтыцы і Беларусі (рабіў рэйсы да бел. партызан, удзельнічаў у вызваленні Мінска, ліквідацыі *мінскага «катла»*). Зрабіў 386 баявых вылетаў. Пасля вайны да 1979 на камандных і штабных пасадах і ў цэнтр. апараце Мін-ва абароны СССР.

ТАРА́Н ДУБІ́ЛЬНЫ, драсён дубільны (Polygonum coriarium), кветкавая расліна сям. драсёнавых. Пашырана ў лясах і на горных лугах Сярэдняй Азіі. Інтрадукавана ў Цэнтр. бат. садзе Нац. АН Беларусі.

Шматадовая травяністая расліна выш. да 2 м. Сцёблы разгалінаваныя, голыя або апушаныя. Лісце яйцападобнае, на кароткіх чаранках, часта знізу апушанае. Кветкі невял., белыя, у буйных мяцёлчатых суквецці. Плод — арэшак. Карані маюць дубільныя рэчывы (15—30%). Дубільная, меданосная і кармавая расліна.

ТАРА́НДА Мікалай Іванавіч (н. 15.8.1947, в. Падлессе Ляхавіцкага р-на Брэсцкай вобл.), бел. мастак. Скончыў Віцебскі пед. ін-т (1970). У 1970—94 нач. бюро прамысл. эстэтыкі з-да «Чырвоны Кастрычнік» (г. Орша), адначасова ў 1970—91 кіраўнік студыі выяўл. мастацтва Палаца культуры з-да. Працуе ў графіцы, скульптуры, станковым жывапісе, пераважна ў жанрах пейзажа і нацюрморта. Стварыў графічныя серыі «Аршаншчына» (1973), «Вільня» (1976), «Мантажнікі» (1977), «Сенежскае возера» (1977—79), «Сёстры» (1983), «Крым» (1987—89); скульптурныя партрэты А.Папкова (1973), Аксаны (1974), бацькі (1975), помнік жыхарам г. Барань, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну (1985; разам з А.Сапіным). Жывапісным работам уласцівы дынамізм, колеравая экспрэсія, маляўнічасць вобразнага ладу: «Вёска Барань» (1985), «Кветкі Беларусі» (1986), «Ружы» (1987), «Суздаль», «Чэрвеньская рапсодыя» (абедзве 1994), «Памяці Сезана» (1995), «Абуджэнне», «Лілеі», «Памяці А.Арлова» (усе 1996), серыі «Балгарыя», «Віцебшчына» (усе 1997—2002).

Літ.: Крепак Б. Николай Таранда: Живопись, графика: [Альбом]. Каунас, 1997; Коктыш Л. «Художник — это состояние внутренней свободы» // Беларусь. 1999. № 4.

Г.А.Фатыхава.

ТАРАНЕ́НКА Леанід Аркадзевіч (н. 13.6.1956, г. Маларыта Брэсцкай вобл.), бел. спартсмен (цяжкая атлетыка; I і II цяжкая вага). Засл. майстар спорту СССР (1980). Скончыў Бел. ін-т механізацыі сельскай гаспадаркі (1979). З 1977 інструктар Спарт. к-та Беларусі; у 1994—2000 трэнер і эксперт зборных каманд Індыі па цяжкай атлетыцы. Чэмпіён XXII Алімп. гульняў (1980, Масква), сярэбраны прызёр XXV Алімп. гульняў (1992, г. Барселона, Іспанія). Чэмпіён свету (1980, 1991), бронз. прызёр (1979). Чэмпіён Еўропы (1980, 1988, 1991, 1992, 1996). 19-разовы рэкардсмен свету.

ТАРА́НІС, у старажытнай кельцкай міфалогіі бог грому і нябеснага агню. *Галы* ўяўлялі яго барадатым волатам, які трымае ў руках кола і некалькі спіралей. Рымляне часам атаясамлівалі Т. з *Юпітэрам*.

ТАРАНО́ВІЧ Уладзімір Эраставіч (25.11.1897, Мінск — 25.2.1983), генерал-палкоўнік артылерыі (1944). Скончыў Ваенна-тэхн. акадэмію імя Дзяржынскага (1932). У арміі з 1914, у Чырв. Арміі з 1918. Удзельнік грамадз. 1918—20, сав.-фінл. 1939—40 войнаў. У Вял. Айч. вайну з ліп. 1941 на Зах., Волхаўскім, Паўд.-Усх., Сталінградскім франтах, у Маскоўскай зоне абароны: нач. артылерыі арміі, фронту, нам. камандуючага бранятанк. і механіз. войскамі па артылерыі. Удзельнік Маскоўскай, Сталінградскай бітваў, Корсунь-Шаўчэнкаўскай, Вісла-Одэрскай аперацый, вайны з Японіяй 1945. Да 1953 у войсках і цэнтр. апараце Мін-ва абароны СССР.



Л.А.**Тараненка**.



У.Э.**Тарановіч**.

ТА́РАНТА (Taranto), горад на Пд Італіі. Адм. ц. аднайм. правінцыі. Засн. каля 700 да н.э. спартанцамі. Каля 300 тыс. ж. (2001). Порт у зал. *Таранта*, вузел чыгунак і аўтадарог. Буйнейшы ў краіне металург. камбінат. Прам-сць: маш.-буд., нафтаперапр., коксахім., харчовая. Завод па апрасненні марской вады. Гадоўля вустрыц. Рыбалоўства. Арх. помнікі 12—19 ст. Ваен.-марская база.

ТА́РАНТА (Taranto), заліў Іанічнага м., на Пд Італіі, паміж п-вамі Саленціна і Калабрыя. Даўж. 138 км, шыр. каля ўвахода 133 км. Глыб. да 2657 м. Прылівы паўсутачныя (0,3 м). Буйны порт *Таранта*.

ТАРА́НТУЛЫ, некалькі відаў павукоў роду ліказа (Licosa) сям. павукоў-ваўкоў. Пашыраны ў пустынях, паўпустынях і стэпах Пд Усх. Еўропы, Сярэдняй Азіі, Паўн. Афрыкі, часам трапляюцца ў лясной зоне. Жывуць пераважна па далінах рэк, у норах. Найб. вядомы Т. паўднёварускі, або мізгір (L. singoriensis).

Даўж. да 6 см. Цела ўкрыта валаскамі. Маюць ядавітыя залозы. Насякомаедныя.

С.Л.Максімава.

ТАРАНТЭ́ЛА (італьян. tarantella, ад назвы г. Таранта), італьянскі нар. танец. Муз. памер 6/8, 3/8 з характэрным беспарапынным рухам трыёлямі. Тэмп хуткі, імклівы. Суправаджаецца ігрой на гітары, ударамі тамбурына (інструмента накшталт бубна), кастаньет (у Сіцыліі), часам спевам. У 19 ст. канцэртная інстр. п'еса (М.Глінка, Ф.Ліст, Дж.Расіні, П.Чайкоўскі і інш.). Т. ствараліся і як віртуозныя п'есы ў духу perpetuum mobile (Т. для скрыпкі Н.Паганіні).

Н.В.Сазановіч.



М.**Таранда**.
Вёска Барань. 1985.

ТАРАНУ́ХА Рыгор Іванавіч (н. 25.9.1933, пас. Вазнясенск Клімаўскага р-на Бранскай вобл., Расія), бел. вучоны ў галіне селекцыі і генетыкі с.-г. раслін. Чл.-кар. аграрнай АН Беларусі (1996), д-р с.-г. н. (1979), праф. (1980). Засл. дз. нав. Беларусі (1990). Скончыў БСГА (1962), дзе і працуе з 1966 (з 1976 заг. кафедры). Навук. працы па генетыцы і селекцыі лубіну, насенняводстве і тэхналогіі вырошчвання с.-г. культур. Аўтар сартоў жоўтага кармавога лубіну: Акадэмічны 1, Акадэмічны 2, Горацкі, БСГА-382.

Тв.: Селекция и семеноводство люпина. Мн., 1980; Частная селекция и сортоведение зерновых культур. Горки, 1987; Частная селекция и сортоведение зернобобовых культур в Белоруссии. Горки, 1989; Селекция и семеноводство сельскохозяйственных культур. Мн., 2001; Люпин: биология, селекция и технология возделывания. Горки, 2001.

ТАРАНХАЯВА́ҒАН, у міфах *іракезаў* бог — сусветаствараль нік і апякун палявання. Т. і яго брат-антаганіст Тавіскаран (бог зімы, холаду і змроку) стварылі сусвет паводле ўласнага разумення: Т. — занадта добрым, яго брат — вельмі дрэнным. Гэта скончылася паядынкам, у якім Тавіскаран забіты. Т. перамог племя волатаў-людаедаў і вял. гарбуна Хадугону, які ўвасабляў хваробы і смерць.

ТАРАНЦЕ́Й Віктар Пятровіч (н. 6.3.1946, в. Ізабелін Ваўкавыскага р-на Гродзенскай вобл.), бел. вучоны ў галіне педагогікі. Канд. пед. н. (1979), праф. (1991). Скончыў Гродзенскі пед. ін-т (1967). З 1979 у Гродзенскім ўн-це (з 1982 заг. кафедры, з 1992 прарэктар, з 1995 дэкан ф-та). Навук. працы па праблемах бесперапыннай пед. адукацыі, выхавання моладзі, сістэмы адукацыі ў зах.-еўрап. краінах.

Тв.: Лицом к молодежи. Мн., 1990; Подготовка учителя в условиях непрерывного образования. Гродно, 1993; Сацыяльныя ўстановы для дзяцей і моладзі ў сучаснай Швецыі // Адукацыя і выхаванне. 1998. №10; Проблемы педагогики молодого учителя. Гродно, 1999 (у сааўт.); Система образования взрослых в Германии. Гродно, 2001 (разам з І.М.Ліпкінай); Социально-педагогические проблемы подготовки учителя в условиях непрерывного образования. Гродно, 2001.



Тарантул паўднёварускі.

ТАРАНЧУ́К Валерый Барысавіч (н. 25.5.1948, г. Іванава Брэсцкай вобл.), бел. матэматык. Д-р фіз.-матэм. н. (1992). Скончыў Маскоўскі ун-т (1971). З 1974 у НДІ прыкладных фіз. праблем БДУ (з 1975 заг. лабараторыі). З 1998 у БДУ (з 2000 заг. кафедры). Навук. працы па матэм. мадэліраванні. Распрацаваў мадэлі, метады разліку, праграмнае забеспячэнне выліч. эксперыментаў для даследавання працэсаў падземнай гідрадынамікі; на аснове распрацаваных матэм. і праграмнага забеспячэнняў стварыў (разам з інш.) некалькі прадметных геаінфармацыйных сістэм.

Тв.: Численное моделирование процесса неустойчивого вытеснения нефти водой (разам з У.М.Ентавым) // Изв. АН СССР. Механика жидкости и газа. 1979. №5; Методика, инструментарий адаптации математических моделей процессов подземной гидродинамики (разам з С.А.Барвенавым, М.Ф.Кібашам) // Выбр. навук. пр. БДУ. Т. 6. Матэматыка. Мн., 2001.

ТА́РАС Валянцін Яфімавіч (н. 9.2.1930, Мінск), бел. пісьменнік. Скончыў БДУ (1955). Працаваў у гродзенскай літаграфіі, на фабрыцы ў Мінску, у газ. «Звязда» (1955—62), час. «Нёман» (1964—68). Друкуецца з 1948. Піша на рус. і бел. мовах. У вершах і прозе тэмы сталення падлеткаў, гераізм народа ў Вял. Айч. вайну, кахання, сяброўства, вернасці, пошуку ідэалу: зб-кі вершаў «Мінска вуліцы родныя» (1959), «Давер» (1960), «Трывожная зямля» (1963), «Два сшыткі» (1982), «Пазіцыя» (1987); кнігі прозы «Першая маланка» (1973), «Ні хвіліны раскаяння» (1974), «Пад сузор'ем Льва» (1978), «Роздум» (1984). Аўтар сцэнарыяў дакумент. фільмаў «Наш Пімен» (пра П.Панчанку; 1967), «Жаўранкі ляцяць на Палессе» (1975), «Зорка Максіма» (пра М.Багдановіча; 1980), «Вяртанне ў першы снег» (пра Р.Барадуліна; 1985; усе паст. на «Беларусьфільме»), п'есы «Не патушы свечку» (паст. Бел. тэлебачаннем, 1974). На рус. мову пераклаў раман Г.Гарсія Маркеса «Восень патрыярха» (1978, з К.Шэрманам); кнігі В.Быкава, С.Гаўрусёва, С.Грахоўскага, У.Корбана, У.Нядзведскага; вершы Э.Агняцвет, П.Броўкі, Барадуліна, А.Вярцінскага, В.Зуёнка, П.Макаля, М.Танка і інш. Яго пераклады з бел. мовы сабраны ў кн. «Пах мёду» (1986). Для Бел. т-ра імя Я.Купалы на бел. мову пераклаў п'есу Я.Шварца «Дракон».

Тв.: Прощальные костры: Избр. повести и рассказы. Мн., 1980; Дань времени: Избр. повести и рассказы. Мн., 1990. *І.У.Саламевіч.*

ТА́РАС Ніна Міхайлаўна (н. 15.5.1916, в. Заполле Навагрудскага р-на Гродзенскай вобл.), бел. паэтэса. У 1930—34 вучылася ў Навагрудскай бел. гімназіі. Скончыла бел. гімназію ў Вільні (1936), Вышэйшыя літ. курсы ў Маскве (1957). У 1942—44 сувязная лідскай спецгрупы партыз. брыгады імя Кірава і партыз. атрада імя Катоўскага брыгады імя Дзяржынскага Баранавіцкай вобл. Працавала ў лідскай раённай газ. «Уперад» (1939—41, 1944—45), Дзярж. выд-ве Беларусі (1945—46), газ. «Піянер Беларусі» (1951—53). Друкуецца з 1936. Першы зб. вершаў «На ўсход ідучы...» (1940). У вершах Т. адчуванне прыгажосці роднага краю, лірызм, вера ў перамогу дабра над злом і інш.: зб-кі «Суніцы» (1946), «Вершы» (1952), «У тапаліную замець» (1976). Піша для дзяцей: зб-кі паэзіі «Казкі пра абавязкі» (1955), «Наш бор» (1968). На некат. яе вершы напісаны песні.

Тв.: Кветка шчасця. Мн., 1958; Пад белым яварам. Мн., 1966; Праметэю прыйду пакланіцца. Мн., 1981; Праз вятры-завеі. Мн., 1986.

Літ.: Л о й к а А. Паэзія і час. Мн., 1981; К о ў т у н В. Паэзія подзвігу // Полымя. 1983. №1.

«ТАРА́С НА ПАРНА́СЕ», сатырычна-гумарыстычная паэма; помнік бел. літаратуры 19 ст. Вераго дна, напісана ў 1850-я г. Доўгі час распаўсюджвалася ў рукапісах, упершыню апубл. як ананімны твор у газ. «Минский листок» (№37 за 16.5.1889). Праблема аўтарства складаная. Выказваліся думкі, што паэма належыць пяру В.Дуніна-Марцінкевіча ці А.Вярыгі-Дарэўскага, але творчая манера гэтых пісьменнікаў далёкая ад манеры аўтара паэмы. Меркавалі, што паэму напісаў В.Равінскі, з імем якога звязвалі паэму «*Энеіда навыварат*», або беглы дзекабрыст, які пад імем Яўхіма Крупенькі жыў у Клімавіцкім пав. на Магілёўшчыне. Большасць даследчыкаў аддавала перавагу меркаванню этнографа Е.Р.Раманава, што аўтар паэмы — адзін са студэнтаў Горы-Горацкага земляробчага ін-та. Былі падставы думаць, што паэма напісана якім-н. пецярбургскім літаратарам-беларусам, цесна звязаным з рус. літ. коламі. Перспектывы для даследчыкаў адкрыў спіс паэмы з паметай: «К.Вераніцын, 15.4.1855, Гарадок» (гл. *Вераніцын К.В.*). Апошнім часам паэма ўсё часцей друкуецца як аўтарскі твор Вераніцына. У снежні 2001 у г. Гарадок Віцебскай вобл. і на радзіме Вераніцына ў в. Астраўляны Гарадоцкага р-на ўстаноўлены мемарыяльныя знакі ў гонар паэмы і яе верагоднага аўтара. Магчыма, у напісанні паэмы ўдзельнічаў гімназічны таварыш Вераніцына *Я.Вуль.*

Сюжэт твора — прыгоды палясоўшчыка Тараса, які, выправіўшыся аднойчы ў пушчу, трапіў знянацку на Парнас — месца знаходжання багоў і паэтаў. Некат. вонкавымі адзнакамі твор прымыкае да травесційных паэм (гл. *Бурлеска*), да «Энеіды навыварат». Але зніжэнне вобразаў стараж. багоў і герояў і барацьба з эстэтыкай класіцызму не гал. мэта аўтара. У паэме даецца яскравая, напоўненая мноствам рэалій карціна побыту бел. сялян. З вял. сімпатыяй і майстэрствам створаны вобраз Тараса — адзін з першых рэаліст. вобразаў чалавека з народа ў бел. л-ры. Другая важная тэма — адлюстраванне

становішча ў рус. л-ры сярэдзіны 19 ст., барацьбы перадавога і рэакц. кірункаў у ёй. Гэтаму прысвечана сцэна ўзыходжання пісьменнікаў на Парнас. Сімпатыі аўтара цалкам на баку перадавых пісьменнікаў, якія вызначалі сваёй творчасцю развіццё л-ры. Сваёй эстэт. сістэмай, дэмакр. сутнасцю паэма скіравана супраць эстэтыкі афіц. народнасці, супраць булгарынскай псеўданар. эстэтыкі. У паэме сатыр. выпады супраць славянафільскай ідэалізацыі патрыярхальнага побыту, адмаўленне сентыменталізму, уласцівага некат. творам тагачаснай бел. л-ры. Паэма адстойвала сапраўдную народнасць л-ры, сцвярджала неўміручасць народа, яго таленавітасць і жыццялюбства. Твор напісаны 4-стопным ямбам пушкінскай школы, у аснове мовы — усх.-бел. гаворкі, якімі аўтар валодае віртуозна. Адчуваецца цесная сувязь з фальклорам, нар. гумарыстычным апавяданнем. Вялікую ролю адыгрываюць нар. параўнанні, выслоўі, устойлівыя звароты. Арыгінальным сюжэтам, высокім узроўнем маст. дасканаласці «Т. на П.» — якасна новая з'ява ў бел. л-ры. Яна адыграла вял. ролю ў станаўленні бел. літ. мовы, развіцці бел. л-ры, ва ўмацаванні дэмакр.-рэаліст. кірунку ў ёй. Перакладзена на рус., укр., польск., англ. мовы.

Публ.: Энеіда навыварат; Тарас на Парнасе. Мн., 1982; Тарас на Парнасе: Нар. паэма. Мн., 1998.

Літ.: Лазарук М.А. Станаўленне беларускай паэмы. Мн., 1968; Шаўцоў П. Спрадвечнае. Мн., 1973; Кісялёў Г.В. Пошукі імя. Мн., 1978; Яго ж. Разыскивается классик...: Пер. с бел. Мн., 1989; Скалабан В. Новыя матэрыялы з гісторыі беларускай літаратуры XIX ст. // Шляхам гадоў. Мн., 1990. [Вып. 1.]; Хаўстовіч М. Вераніцын ці Вуль? // XIX ст. Навук.-літ. альманах. Мн., 2000. Кн. 2. *Г.В.Кісялёў.*



Тарасы.

ТАРА́СА, сцяна з двух радоў бярвён ці брусоў, прамежак паміж якімі запаўняўся зямлёй і каменнем; тып *абарончага збудавання*. Здаўна вядомы ў драўляным дойлідстве славян. У адрозненне ад *гародняў* Т. ўяўляла сабой суцэльную сцяну, падзеленую папярочнымі сценкамі на шэраг прамавугольных у плане адсекаў. У верхняй ч. мела баявы ярус з *абламам*, звычайна завершаным 2-схільным дахам. Вядома з 15 ст., на Беларусі — з 16 ст. (гарады Орша, Віцебск). У сувязі з развіццём артылерыі і заняпадам будаўніцтва драўляных абарончых збудаванняў сталі менш пашыранымі.

ТАРА́САВА Ала Канстанцінаўна (6.2.1898, Кіеў — 5.4.1973), расійская актрыса, педагог. Нар. арт. СССР (1937). Герой Сац. Працы (1973). З 1916 у 2-й студыі Маскоўскага Маст. т-ра, з 1924 у Маскоўскім Маст. акад. т-ры (МХАТ; у 1951—55 в.а. дырэктара). Вучаніца К.*Станіслаўскага* і У.*Неміровіча-Данчанкі*. З 1967 выкладала ў Школе-студыі МХАТ (з 1968 праф.). Валодала вял. сцэн. абаяльнасцю, тэмпераментам, выкананне вылучалася эмацыянальнасцю, лірызмам, рамант. рысамі. Актрыса пераважна рус. класічнага рэпертуару: Негіна, Юлія Тугіна («Таленты і паклоннікі» А.Астроўскага), Таццяна («Ворагі», М.Горкага), Ганна («Ганна Карэніна» Л.Талстога), Маша, Ранеўская, Аркадзіна («Тры сястры», «Вішнёвы сад», «Чайка» А.Чэхава). Сярод інш. роляў: Дэздэмона («Атэла» У.Шэкспіра), Марыя Сцюарт («Марыя Сцюарт» Ф.Шылера), Алена («Дні Турбіных» М.Булгакава), Вольга («Хлеб» У.Кіршона), Алена Макараўна («Страх» А.Афінагенава) і інш. Здымалася ў кіно: «Навальніца», «Пётр I», «Без віны вінаватыя» і інш. Дзярж. прэміі СССР 1941, 1946 (двойчы), 1947, 1949.

Літ.: А.К.Тарасова: Док. и воспоминания. М., 1978.

ТАРА́САВА-РА́ТАМСКАЕ ПАТРЫЯТЫ́ЧНАЕ ПАДПО́ЛЛЕ ў Вялікую Айчынную вайну. Дзейнічала ў ліп. 1941 — сак. 1942 у в. Тарасава і пас. Ратамка Мінскага р-на (кіраўнікі П.М.Бортнік, А.І.Вольскі, П.Ф.Кургаеў, В.І.Лошыцкі, Я.У.Саблер). Падпольшчыкі (28 чал.) вялі паліт. агітацыю сярод насельніцтва, прымалі па радыё і распаўсюджвалі зводкі Саўінфармбюро, ратавалі і лячылі воінаў Чырв. Арміі, якія трапілі ў акружэнне. Па заданні Мінскага патрыят. падполля для стварэння партыз. атрада збіралі зброю і боепрыпасы, і да канца сак. 1942 група падпольшчыкаў і чырвонаармейцаў была падрыхтавана да выхаду ў лес. У ноч на 3 крас. фашысты арыштавалі і пасля катаванняў расстралялі кіраўнікоў і шмат удзельнікаў падполля. Паблізу в. Тарасава ў гонар падпольшчыкаў помнік.



В.П.**Тарасаў**.

ТАРА́САЎ Анатоль Уладзіміравіч (10.12.1918, Масква — 23.6.1995), расійскі спартсмен, трэнер; адзін з заснавальнікаў сав. школы хакея з шайбай. Засл. майстар спорту СССР (1949). Засл. трэнер СССР (1957). Канд. пед. н. (1971). Палкоўнік. Чэмпіён СССР (1948, 1949, 1950). У 1947—75 трэнер хакейнай каманды ЦДКА/ЦСКА; у 1948—72 (з перапынкам) — зборнай каманды СССР па хакеі з шайбай, 3-разовага чэмпіёна Алімп. гульняў і 9-разовага — свету.

Тв.: Тактика хоккея. М., 1963; Хоккей грядущего. 2 изд. М., 1971; Путь к себе. М., 1974; Настоящие мужчины хоккея. М., 1987; Хоккей без тайн. М., 1988. *А.М.Петрыкаў.*

ТАРА́САЎ Віктар Паўлавіч (н. 29.12.1934, г. Барнаул, Расія), бел. акцёр. Нар. арт. Беларусі (1967). Нар. арт. СССР (1982). Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1957). Акцёр шырокага творчага дыяпазону. Добрыя знешнія даныя, тэмперамент, шчырасць абумовілі поспех Т. ў ролях маладых герояў: Кузьмін («Людзі і д'яблы» К.Крапівы), Міхаіл («Лявоніха на арбіце» А.Макаёнка), Вадзім («Выклік багам» А.Дзялендзіка), Валерык («Трэцяя патэтычная» М.Пагодзіна), Генадзь («Мільён за ўсмешку» А.Сафронава) і інш. Дасканалым майстэрствам пераўвасаблення, высокай акцёрскай тэхнікай, псіхал. дакладнасцю і адзінствам знешняй і ўнутр. характарнасці вызначаюцца ролі: Канстанцін Заслонаў («Канстанцін Заслонаў» А.Маўзона), Францыск Скарына («Напісанае застаецца» А.Петрашкевіча), Сцяпан Дзямідчык («Апошні журавель» А.Дударава і А.Жука), Мульцік («Вечар» Дударава), Салавейчык («Амністыя» М.Матукоўскага), Ухватаў («Пагарэльцы» Макаёнка), Клеон («...Забыць Герастрата!» Р.Горына), Няхлюдаў («Уваскрэсенне» паводле Л.Талстога), Дульчын («Апошняя ахвяра» А.Астроўскага), Барон, Пратасаў («На дне», «Дзеці сонца»



А.**Тарасава** ў ролі Ганны Карэнінай.

М.Горкага), Гараднічы («Рэвізор» М.Гогаля), Сафонаў («Рускія людзі» К.Сіманава), Кэлін («Святая святых» І.Друцэ), Бачана Рамішвілі («Закон вечнасці» паводле Н.Думбадзе), Ахмед Рыза («Дзівак Назыма Хікмета) і інш. Здымаўся ў фільмах: «Першыя выпрабаванні», «Бацька», «Крушэнне імперыі», «Уваскрэсная ноч», «Соф'я Пяроўская», «Дзяржаўная граніца», «Дэбют», «Вадзіцель аўтобуса», «Песня пра зубра» і інш. Удзельнічаў у тэлепастаноўках: «Крах», «Людзі на балоце». Дзярж. прэмія Беларусі 1966.



В.**Тарасаў** у ролі Пратасава.

Літ.: Краўчанка Г. Віктар Тарасаў // Майстры беларускай сцэны. Мн., 1978. Кн. 3; Ярмалінская В. «Брава, Віктар!..»: Нарыс жыцця і творчасці нар. артыста СССР, акцёра Нац. акад. тэатра імя Янкі Купалы Віктара Тарасава. Мн., 1999. *В.А.Ракіцкі.*

ТАРА́САЎ Вячаслаў Аляксеевіч (17.10.1938, г. Растоў Яраслаўскай вобл., Расія — 20.1.1997), бел. мастак. Скончыў Маскоўскі тэкстыльны ін-т (1962). Працаваў у Рэсп. доме мадэлей у Мінску (1963—70), Бел. рэсп. т-ры юнага гледача (1971—75), з 1976 на кінастудыі



В.**Тарасаў**. Ілюстрацыя да кнігі «П'есы» Лопэ дэ Вэгі. 1981.

«Беларусьфільм». Афарміў спектаклі «Пэпі — доўгая панчоха» (1970) і «Новыя прыгоды Карлсана» (1973) паводле А.Ліндгрэн, «Зялёная птушка» К.Гоцы, «Авадзень» Э.Л.Войніч (абодва 1972), «Дзяўчына і красавік» Т.Ян (1971) і інш. Мастак мультфільмаў «Папяровая казка» (1976), «Светлячок і расінка» (1978), «Казка пра вясёлага клоуна» (1980), «Песня пра зубра» (1982), «Каўбойскія гульні» (1986) і інш. Працаваў таксама ў кніжнай графіцы (ілюстрацыі да твораў В.Вольскага, К.Кірэенкі, Лопэ дэ Вэгі, Ю.Свіркі, А.Твардоўскага, А.Сімурава і інш.), станковым жывапісе («Салдаты», «Юнацтва», «Зялёны луг», «Акно», «Дзяцінства» і інш.).

ТАРА́САЎ Канстанцін Іванавіч (н. 10.10.1940, Мінск), бел. пісьменнік, публіцыст. Скончыў БПІ (1965). Працаваў у геал. экспедыцыі, на заводзе ў Мінску, у выд-ве «Вышэйшая школа» (1967—75), на кінастудыі «Беларусьфільм», у перыяд. друку, у т.л. ў час. «Нёман» (1977—83), «Спадчына» (1989—95) і інш. Друкуецца з 1966. Піша на рус. і бел. мовах. Асн. тэма твораў — гіст. мінулае Беларусі. Аўтар аповесці пра Грунвальдскую бітву «Дзень рассеяння» (1980), зб. гіст.-літ. нарысаў «Памяць пра легенды: Беларускай даўніны галасы і абліччы» (1984), гіст. аповесцей «Пагоня на Грунвальд» (1980), рамана «Тры жыцці княгіні Рагнеды» (1994). Маральна-этыч. праблемы ў творах дэтэктыўнага жанру (зб-кі «У час Стральца», 1981; «Залатая горка...», 1998, і інш.).

Тв.: Странствие в тесном кругу: Повести. Мн., 1986; Памяць пра легенды: Постаці бел. мінуўшчыны. Мн., 1990; Единственный свидетель — Бог: Повести. Мн., 1991; Апошняе каханне князя Міндоўга. Мн., 2000; Беларусь: Гіст. падарожжа для дзяцей. Мн., 2000; Крыж Памяці: Кароткі спіс войнаў, паўстанняў, рэпрэсіяў, катастрофаў, якія выпалі на лёс Беларусі за тысячагоддзе. Мн., 2000.

І.У.Саламевіч.

ТАРА́САЎ Уладзімір Іванавіч (н. 10.9.1948, в. Шчыткавічы Старадарожскага р-на Мінскай вобл.), бел. вучоны-эканаміст. Д-р эканам. н. (1989), праф. (1998). Скончыў Бел. ін-т нар. гаспадаркі (1975). З 1978 у Ін-це эканомікі Нац. АН Беларусі (з 1986 заг. аддзела, з 1989 нам. дырэктара), з 1994 у Нац. банку Рэспублікі Беларусь (з 1995 кіраўнік групы дарадчыкаў пры праўленні), з 1996 у Бел. эканам. ун-це, з 1999 заг. кафедры БДУ. Навук. працы па праблемах грашова-крэдытнай палітыкі, банкаўскай справы і цэнаўтварэння.

Тв.: Стоимость и цена машин в условиях интенсивного хозяйствования. Мн., 1985; Теория цены на новую технику. Мн., 1989; Денежно-кредитная политика Республики Беларусь: инструменты гос. регулирования. Мн., 1998; Деньги, кредит, банки. Мн., 1998; Современная монетарная политика. Мн., 1999; Деньги. Денежно-кредитная политика. Банковское дело. Мн., 2001.

ТАРАСЕ́ВІЧ Лявон (н. 14.3.1957, ст. Валілы Падляскага ваяв., Польшча), польскі мастак бел. паходжання. Скончыў Варшаўскую АМ (1984), з 1996 выкладае ў ёй. Творы, як правіла, без назваў, вял. памеру, увасабляюць адмысловае аўтарскае бачанне, паказваюць геаметрызаваныя зямныя краявіды ўзаранага поля, скошанага лугу, заснежанага лесу, сцяны дажджу, сухіх кветак, камянёў, а таксама Вял. Каньёна (ЗША). Вобразнасць і перакананасць дасягаецца праз выкарыстанне мінімуму выяўл. сродкаў, чыстых і адкрытых фарбаў і колеру. Арганізатар Бел. аб'яднання студэнтаў (1981), Бел. дэмакр. аб'яднання (1990), рок-фестывалю «Басовішча» (1993).

В.А.Трыгубовіч.



Л.**Тарасевіч**. Без назвы. 1990.

ТАРАСЕ́ВІЧ Ян (Іван Аляксеевіч; 23.9.1889, г. Саколка Падляскага ваяв., Польшча — 18.6.1961), піяніст, кампазітар, педагог. Скончыў Полацкі кадэцкі корпус (1903), Пецярбургскую кансерваторыю (1912, кл. М.Быстрова; 1915, кл. Я.Вітала). З 1912 выкладаў у прыватнай школе М.Быстрова ў Пецярбургу; у 1918—45 у Саколцы і адначасова ў 1918—20 у Гродне; з 1947 у Беластоку ў школе Франкевічанак. На Беларусі збіраў фальклор. Яго творы адметныя развітой меладычнасцю, тэхн. дасканаласцю кампазіцыі, выкарыстаннем фальклору, у т.л. беларускага. Сярод твораў (захавалася 110) — канцэрт і 3 санаты для фп., Бел. фантазія, сюіты, вальсы, эцюды, прэлюдыі, фп. п'есы ў 4 рукі, творы для стр. інструментаў, хору, у т.л. на вершы Я.Коласа і Ф.Багушэвіча, рамансы на вершы М.Багдановіча («Даўно ўжо целам я хварэю...» і «Плакала лета, зямлю пакідаючы...»), некат. рус. і польскіх паэтаў. Сярод вучняў Е.Максымюк, А.Брагінская, Т.Казакевіч, В.Кулікоўскі. *В.І.Скорабагатаў.*

ТАРАСЕ́ВІЧЫ, бел. гравёры канца 17 — пач. 18 ст., верагодна, браты. Як мяркуюць, вучыліся ў гравёраў Кіліянаў у г. Аўгсбург (Германія). Працавалі ў тэхніках афорта і разцовай гравюры. З творчасцю Т. звязаны значныя дасягненні мастацтва барока ў бел. гравюры.

Аляксандр (Антоній; ? г.п. Глуск Магілёўскай вобл. — каля 1730). Творы адметныя цэласнасцю кампазіцыі, шчыльнасцю і дасканаласцю штрыхоўкі, багатай танальнасцю, глыбінёй псіхал. характарыстыкі партрэтаў. У ранні перыяд дзейнасці (у Глуску) стварыў цыкл з 40 афортаў да аўсбургскага выдання кн. «Ружоўнік...» (1672). У шэрагу гравюр паказаў побыт сялян і на-

вакольную прыроду (асабліва ў 12 гравюрах «Поры года»). У 1680-я г. працаваў у Вільні, дзе выканаў партрэты мінскага харунжага К.Клакоцкага, караля Рэчы Паспалітай Яна III Сабескага. Потым пераехаў у Кіеў, прыняў манаства і імя Антоній. Аўтар эстампаў «Радаслоўнае дрэва А.Палубінскага» (1675), партрэтаў М.Слупскага (1677), М.Паца (1686),



Да арт. **Тарасевічы**. А.Тарасевіч. Тытул «Ружоўніка...». 1672.



Да арт. **Тарасевічы**. Л.Тарасевіч. Партрэт ашмянскага прыстольніка Г.Зямлі. Канец 17 ст.

І.Перахрэста (1689), В.Галіцына (1691). Л я в о н ц і й (1650? — 1710?). Творы адметныя жыццёвасцю вобразаў, цэласнасцю кампазіцыі, дакладнасцю малюнка, разнастайнасцю штрыхоўкі. Ранні перыяд творчасці звязаны з Беларуссю і Літвой: «Апосталы Пётр і Павел з цудадзейным абразом Жыровіцкай Багародзіцы», партрэты К.С.Радзівіла, ашмянскага прыстольніка Г.Зямлі, смаленскага епіскапа Б.Корвін-Гансеўскага (канец 1690-х г.), гербы віленскага епіскапа К.Бржастоўскага (1682), Агінскіх (1686) і інш., афармленне «Служэбніка» (1695); у творах шырока выкарыстаны барочныя сімвалы і алегорыі. У 1680-я г. пераехаў на Украіну. У 1688 запрошаны ў Маскву, дзе выканаў партрэт рус. царэўны Соф'і. Значныя творы гэтага перыяду: гравюры да кнігі «Пацярык Пячэрскі» (1702), «Псалтыр» і «Евангелле» (абодва 1703).

Літ.: С т е п о в и к Д. Олександр Тарасевич. Київ, 1975; Я г о ж. Леонтій Тарасевич и українське мистецтво барокко. Київ, 1986.

В.Ф.Шматаў.

ТАРА́СЕНКА Васіль Радзівонавіч (7.11.1899, г. Пётркаў-Трыбунальскі Лодзінскага ваяв., Польшча — 7.12.1972), бел. археолаг. Канд. гіст. н. (1947). Скончыў Маскоўскі археал. ін-т (1922), Смаленскі ун-т (1926). У 1929—41 навук. супрацоўнік Магілёўскага гіст. музея, выкладчык Магілёўскага пед. ін-та. З 1944 навук. супрацоўнік, у 1963—66 заг. сектара археалогіі Ін-та гісторыі АН БССР, выкладчык БДУ і Мінскага пед. ін-та. Даследаваў помнікі каменнага і жал. вякоў на тэр. Смаленскай і Магілёўскай абл. Першы пачаў вывучаць стараж. Мінск, дзе адкрыў драўляную гар. забудову, вулічныя маставыя з бярвён 11—13 ст., фундамент храма 12 ст. Выявіў шмат розных вырабаў гар. рамеснікаў, у т.л. залаты бранзалет са змяінымі галовамі. Вёў раскопкі ў Полацку, Ваўкавыску. Адзін з аўтараў кніг «Гісторыя Мінска» (1967), «Гісторыя Беларускай ССР» (т. 1, 1972), «Нарысы па археалогіі Беларусі» (ч. 2, 1972) і інш.

Т.М.Каробушкіна.

ТАРАСЕ́НКА Кірыла Сідаравіч (н. 15.6.1913, с. Талдысай Хобдынскага р-на Акцюбінскай вобл., Казахстан), бел. скрыпічны майстар. З 1948 працаваў на мінскіх аўта- і падшыпнікавым заводах. Сярод вырабаў: скрыпкі і альты (у т.л. скрыпкі з нетрадыц. пародаў дрэва), смычкі (стварыў уласную тэхналогію вырабу якасных смычкоў шляхам камбінавання розных мясц. пародаў дрэва). Вынаходнік спосабу прыгатавання бурштынавага лаку для пакрыцця інструментаў.

М.Д.Браценнікаў.

ТАРАСЕ́НКА Мікалай Уладзіміравіч (н. 7.11.1952, в. Благаўка Шклоўскага р-на Магілёўскай вобл.), бел. фізік. Д-р фіз.-матэм. н. (2000). Скончыў Гомельскі ун-т (1975). З 1975 у Ін-це фізікі, з 1992 у Ін-це малекулярнай і атамнай фізікі Нац. АН Беларусі. Навук. працы па лазернай спектраскапіі, фізіцы і хіміі плазмы. Распрацаваў фіз. асновы лазерна-флюарэсцэнтнай спектраскапіі для дыягностыкі плазмы і ўстанавіў асн. заканамернасці і асаблівасці фіз. і хім. працэсаў для розных тыпаў плазмы.

Тв.: Лазерная абсорбционная и флуоресцентная диагностика плазмы (разам з В.С.Бураковым, С.М.Райковым) // Журн. прикладной спектроскопии. 1997. Т. 64, №3; Plasma chemistry in laser ablation processes (разам з В.С.Бураковым, Н.А.Савасценка) // Spectrochimica Acta. 2001. Part B. Vol. 56, № 6.

ТАРА́СЕНКІ, вёска ў Запольскім с/с Віцебскага р-на, на правым беразе р. Усвяча. Цэнтр калгаса. За 46 км на ПнУ ад Віцебска. 204 ж., 64 двары (2002). Пач. школа, б-ка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан. Абеліск у гонар 1-й Бел. партыз. брыгады, якая дзейнічала ў наваколлі вёскі.

ТАРА́СІК (па мужу Р ы н к о в і ч) Вера Рыгораўна (30.9.1899, Мінск — 22.4.1986), бел. актрыса, настаўніца. Скончыла Мінскае гар. вучылішча (1916). З 1917 актрыса Першага т-ва бел. драмы і камедыі, Беларускага савецкага тэатра; актыўна ўдзельнічала ў рабоце клуба бел. маст. інтэлігенцыі «Беларуская хатка». У 1920—56 настаўнічала. Як актрыса сфарміравалася пад уплывам Ф.Ждановіча. Вызначалася пераважна ў бел. нац. рэпертуары, дзе стварыла каларытныя нар. характары: Агата і Марыля («Паўлінка» і «Раскіданае гняздо» Я.Купалы), Ганна («Модны шляхцюк» К.Каганца), Ульяна («Хам» паводле Э.Ажэшкі), Дарота і Мар'я («Бязвінная кроў» і «Пісаравы імяніны» У.Галубка) і інш.

Г.І.Сяўковіч.

ТАРА́СІК Уладзімір Пятровіч (н. 1.9.1936, в. Дзешчанка Уздзенскага р-на Мінскай вобл.), бел. вучоны ў галіне праектавання аўтамаб. транспарту. Д-р тэхн. н. (1984), праф. (1986). Засл. вынаходнік Беларусі (1998). Скончыў Бел. ін-т механізацыі сельскай гаспадаркі (1960). З 1971 у Магілёўскім тэхн. ун-це (з 1984 заг. кафедры). Навук. працы па тэорыі руху аўтамабіля, праектаванні гідрамех. перадач. Распрацаваў матэм. мадэлі колавых і гусенічных самаходных машын; метадалогію сінтэзу алгарытмаў адаптыўных інтэлектуальных сістэм кіравання энергет. рэжымамі аўтатрансп. сродкаў. Адзін з распрацоўшчыкаў велікагрузнага аўтасамазвала БелАЗ-540.

Тв.: Проектирование колесных тягово-транспортных машин. Мн., 1984; Математическое моделирование технических систем. Мн., 1997.

ТАРА́СІКАЎ Мікалай Лукіч (16.12.1908, г. Краснаярск, Расія — 11.7.1965), бел. жывапісец, графік. Скончыў Віцебскі маст. тэхнікум (1930), Адэскі маст. ін-т (1935). Стварыў сюжэтна-тэматычныя карціны, партрэты, нацюрморты, пейзажы, плакаты, экслібрысы і інш. Сярод жывапісных работ: «Рыбакі Адэсы» (1935), «Паравознае дэпо» (1938), «Камсамолка», «Інтэр'ер», «Партрэт акадэміка М.М.Нікольскага» (усе 1940), «Квет-

кі» (1941), «Партрэт кампазітара М.Аладава» (1946), «Элеватар у Мінску» (1955), «Народны ўмелец» (1956), «Мужчынскі партрэт» (1957), «Каля каўша» (1958), «Будаўніца» (1960), «Сяргей Ясенін» (1964), «Нацюрморт з півонямі, макамі і рамонкамі» (1965). Эцюдныя па манеры творы Т. вылучаюцца яснасцю кампазіцыйнага мыслення, свежасцю і выразнасцю каларыту, паэтызацыяй маст. вобразаў. Напісаў шэраг артыкулаў пра бел. выяўл. мастацтва.

Літ.: Мікола Тарасікаў: Успаміны аб жыцці і творчасці мастака. Мн., 1977. *М.А.Гугнін.*



М.**Тарасікаў**. Кветкі. 1941.

ТАРАСЮ́К Іван Паўлавіч (22.6.1902, Ерэван — 23.9.1939), удзельнік рэв. руху ў Зах. Беларусі. Скончыў ваен.-паліт. курсы (1928), Ленінградскі камуніст. ун-т (1931). У грамадз. вайну ў атрадзе ЧОН. За рэв. дзейнасць і стварэнне ячэек КПЗБ у 1923 арыштаваны польскімі ўладамі. З-пад арышту ўцёк у СССР. Быў на парт. рабоце ў г. Чыта (Расія). З пач. 1932 на падп. рабоце ў Зах. Беларусі: сакратар Віленскага, Брэсцкага акр. к-таў КПЗБ. У 1932—36 зняволены ў турму. У вер. 1939 стварыў і ўзначаліў т.зв. лятучы атрад, які памагаў Чырв. Арміі вызваляць Зах. Беларусь. Загінуў у баі ў г. Драгічын Брэсцкай вобл. *В.П.Ласковіч.*

ТАРАСЮ́К Любоў Канстанцінаўна (н. 7.12.1953, в. Пінкавічы Пінскага р-на Брэсцкай вобл.), бел. паэтэса, літаратуразнавец. Канд. філал. н. (1980). Скончыла БДУ (1975), з 1978 выкладае ў ім. Друкуецца з 1966. У зб. вершаў «Смага ракі» (1983) любоў да бацькоўскай зямлі, эмацыянальнасць, філас. роздум над гісторыяй і сучаснасцю, складанасць узаемаадносін чалавека з навакольным светам, асэнсаванне сувязі бел. культуры з лёсам народа. Даследуе класічную і сучасную бел. паэзію. Аўтар манаграфіі «Вернасць вытокам: Фальклорныя традыцыі ў сучаснай беларускай паэзіі» (1985).

ТАРАТКЕ́ВІЧ Міхаіл Васілевіч (н. 7.4.1925, в. Чарсцвяды Ушацкага р-на Віцебскай вобл.), бел. філосаф, сацыёлаг і публіцыст. Д-р філас. н. (1977), праф. (1978). Засл. работнік вышэйшай школы Беларусі (1985). Скончыў Віцебскі пед. ін-т (1953), Вышэйшую парт. школу пры ЦК КПСС (1961). З 1961 гал. рэдактар грамадска-паліт. вяшчання Бел. радыё. З 1965 дырэктар Мінскай студыі навук.-папулярных і хранік.-дакумент. фільмаў. У 1969—91 у Мінскай вышэйшай парт. школе, адначасова ў 1972—79 нам. гал. рэдактара час. «Коммунист Белоруссии». Навук. працы па сац. філасофіі, праблемах сацыялогіі працы, фарміравання і дэмакратызацыі кіраўніцкіх адносін, выхавання і патрэбнасцей чалавека, па пытаннях гісторыі грамадз. вайны 1918—22 і Вял. Айч. вайны.

Тв.: Производство, труд, человек. Мн., 1969; Уладзімір Азін. Мн., 1971; Человек и коллектив в системе управленческих отношений. Мн., 1974; Человек. Среда. Потребности. Мн., 1980; Семья и разумные потребности. Мн., 1983; Такой и должна быть легенда. М., 1985; Человек и его потребности. Мн., 1989.

ТАРАШКЕ́ВІЧ Браніслаў Аламавіч (20.1.1892, б. засценак Мацюлішкі, Літва — 29.11.1938), бел. грамадска-палітычны і асветны дзеяч, моваznавец, публіцыст, перакладчык, літаратуразнавец. Акад. Бел. АН (1928). Скончыў Петраградскі ун-т (1916), у якім быў пакінуты для атрымання прафесарскага звання на кафедры рус. мовы і славеснасці (1916—18). У 1918 заг. культ.-асв. аддзела Бел. нац. камісарыята, яго Петраградскага аддзялення. З 1917 адзін з лідэраў *Беларускай сацыялістычнай грамады*, з 1918 — *Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі*. У 1918 выдаў «Беларускую граматыку для школ» (5-е факс. выд. 1991). У 1919 выкладаў бел. і грэч. мовы ў Мінскім бел. пед. ін-це. У 1920 старшы рэферэнт дэпартамента асветы т.зв. *Сярэдняй Літвы*, у 1921—22 дырэктар *Віленскай беларускай гімназіі*, адзін з кіраўнікоў і заснавальнікаў *Таварыства беларускай школы*. У 1922 абраны паслом (дэпутатам) сейма Польшчы, узначаліў у ім *Беларускі пасольскі клуб*. З трыбуны сейма абараняў сац. і нац. правы працоўных Зах. Беларусі. Выступаў у зах.-бел. друку з публіцыст. артыкуламі, прысвечанымі актуальным пытанням нац.-вызв. руху. У 1925 стаў адным з заснавальнікаў *Беларускай сялянска-работніцкай грамады*, старшыня яе ЦК, чл. КПЗБ. Двойчы (1927, 1931) арыштаваны польскімі ўладамі, засуджаны адпаведна на 12 і 8 гадоў. У турме пераклаў на бел. мову «Іліяду» Гамера і «Пана Тадэвуша» А.Міцкевіча. У 1930 спец. распараджэннем прэзідэнта Польшчы вызвалены. У выніку абмену палітвязнямі з вер. 1933 жыў у СССР. Працаваў у Міжнар. агр. ін-це ў Маскве. 6.5.1937 арыштаваны АДПУ СССР па справе «*Беларускага нацыянальнага цэнтра*». 5.1.1938 асуджаны камісіяй НКУС СССР і пракурорам СССР («двойкай») да вышэйшай меры пакарання, расстраляны. Рэабілітаваны Ваен. калегіяй Вярх. суда СССР 26.1.1957.

Тв.: Выбранае: Крытыка, публіцыстыка, пераклады. Мн., 1991.

Літ.: Ліс А. Браніслаў Тарашкевіч. Мн., 1966; Бергман А. Слова пра Браніслава Тарашкевіча: Гіст. жыццяпіс: Пер. з пол. Мн., 1996; Валаховіч А.І., Міхнюк У.М. Споведзь у надзеі застацца жывым. Мн., 1999. *А.С.Ліс.*



Б.А.**Тарашкевіч**.

ТАРАШКЕ́ВІЧ Уладзімір Іванавіч (н. 5.7.1948, Мінск), бел. валтарніст. Засл. арт. Беларусі (1994). Скончыў Дзярж. муз.-пед. ін-т імя Гнесіных (1973). З 1970 выкладчык муз. школ Масквы і Мінска, з 1993 Бел. акадэміі музыкі. Адначасова з 1973 у складзе сімф. аркестра Творчага аб'яднання «Нац. акад. Вял. т-р оперы і балета Рэспублікі Беларусь», канцэртмайстар групы валторн. Выканаўца сольных партый на прэм'ерах спектакляў («Рагнеда» А.Мдывані, «Тыль Уленшпігель» і «Майстар і Маргарыта» Я.Глебава, «Сівая легенда» Дз.Смольскага, «Новая зямля» Ю.Семянякі і інш.). Выступае таксама ў складзе розных сімф. аркестраў. *А.Л.Карацееў.*

ТА́РБА Іван Канстанцінавіч (21.3.1921, с. Беслахуба Ачамчырскага р-на, Абхазія — 1994), абхазскі пісьменнік. Скончыў Сухумскі пед. ін-т (1947). Друкаваўся з 1937. Аўтар вершаў, паэм «На суд таварышаў» (1954), «Праз дзесяць гадоў» (1955), раманаў «Вядомае імя» (1963), «Вочы маёй маці» (1979). На бел. мову яго раман «Сонца ўзыходзіць у нас» пераклаў М.Парахневіч (1979).

Тв.: Рус. пер. — Избр. произв. Т. 1—2. М., 1981; Дорога, которой нет конца...: Стихи, поэмы. М., 1976.

ТАРБАГА́Н, сурок мангольскі (Marmota sibirica), млекакормячая жывёла роду суркоў сям. вавёркавых атр. грызуноў. Пашыраны ў горных і раўнінных стэпах Забайкалля, Тывы, Манголіі, Паўн.-Усх. Кітая. Арэал Т. ізаляваны ад інш. відаў роду. Жывуць у норах, утвараюць паселішчы. Упадаюць у зімовую спячку. Асн. пераносчык узбуджальніка чумы.

Даўж. цела да 60 см, хваста да 11 см. Афарбоўка спіны пясчана-жоўтая з чорнай або цёмна-бурай рабізной; бруха больш цёмнае і рыжае, чым бакі. Вакол вуснаў белая пляма. Расліннаедныя. Нараджаюць 4—5 дзіцянят раз за год. Аб'ект промыслу. *Э.Р.Самусенка.*

ТАРБАГАТА́Й, хрыбет паміж азёрамі Алаколь і Зайсан, на граніцы Казахстана і Кітая. Даўж. каля 300 км. Выш. да

2992 м. Складзены са сланцаў, вапнякоў, пясчанікаў, гранітаў. Развіты карст. Ніжнія часткі схілаў заняты паўпустынямі і стэпамі. Дрэвавая расліннасць па далінах рэк.

ТАРГАВІ́ЦКАЯ КАНФЕДЭРА́ЦЫЯ, саюз магнатаў Рэчы Паспалітай супраць прагрэсіўных рэформ *Чатырохгадовага сейма 1788—92*, які выкарыстала Рас. імперыя з мэтай рэстаўрацыі там дзярж. ладу, што існаваў да прыняцця *Канстытуцыі 3 мая 1791*. Акт Т.к. падпісаны ў С.-Пецярбургу 27.4.1792, фіктыўна абвешчаны ў мяст. Таргавіца (Украіна) 14.5.1792, праз 3 дні пасля пачатку інтэрвенцыі Расіі ў Рэч Паспалітую. Маршалак канфедэрацыі С.Шч.Патоцкі (гл. ў арт. *Патоцкія*). Акт Т.к. называў рас. войскі сяброўскімі, скасоўваў усе рашэнні Чатырохгадовага сейма, у т.л. Канстытуцыю 3.5.1791, заклікаў шляхту злучыцца для «абароны рэспубліканскіх свабод» і тэр. цэласнасці дзяржавы. У ВКЛ адпаведныя канфедэрацыі ў ваяводствах і паветах ствараліся пры падтрымцы царскіх войск. Генеральная канфедэрацыя ВКЛ абвешчана ў Вільні 25.6.1792 у складзе 13 чал., маршалак — А.М.Сапега (гл. ў арт. *Сапегі*). Канфедэрацыю падтрымала каля 40 тыс. шляхціцаў ВКЛ. 11.9.1792 у Брэсце Генеральныя канфедэрацыі ВКЛ і Польшчы злучыліся ў Генеральную канфедэрацыю абодвух народаў, якая ўзяла некат. функцыі дзярж. улады. 24.9.1792 кіраўніцтва канфедэрацыі пераехала ў Гродна для падрыхтоўкі там сейма пад наглядам рас. пасла Я.Я.Сіверса. На тэр. Рэчы Паспалітай увяла свае войскі і Прусія, пасля чаго Расія абвясціла ноту аб падрыхтоўцы *другога падзелу Рэчы Паспалітай*. Кіраўніцтва канфедэрацыі для абароны краіны 11.2.1793 загадала мясц. канфедэрацыям склікаць паспалітае рушэнне і абраць ротмістраў. У сувязі з гэтым 10.3.1793 Сіверс прадаставіў павятовым маршалкам ранг ваявод і 6.5.1793 дазволіў правесці шляхецкія выбары на *Гродзенскі сейм 1793*. Ухваленнем на сейме 2-га падзелу Рэчы Паспалітай і дагавора з Расіяй Т.к. канчаткова скампраметавала сябе і 15.9.1793 распушчана.

Літ.: Тимощук В.В. Тарговицкая конфедерация // Рус. старина. 1904. №9—10; 1905. №1—2; Smoleński W. Konfederacya Targowicka. Kraków, 1903; Kądziela Ł. Między zdradą a służbą Rzeczypospolitej. Warszawa, 1993. *Я.К.Анішчанка.*

ТАРД (Tarde) Габрыэль (12.3.1843, г. Сарла-ла-Канеда, Францыя — 13.5.1904), французскі сацыёлаг і крыміналіст, адзін з заснавальнікаў *псіхалогіі сацыяльнай*. З 1893 узначальваў аддзел у Мін-ве юстыцыі. З 1900 праф. новай філасофіі ў Калеж дэ Франс. Аўтар шэрагу прац «Законы пераймання» (1890), «Сацыяльная логіка» (1894) і інш. Цэнтр. механізмам сац. працэсаў лічыў дзеянне універсальных «законаў пераймання», з якімі звязваў і сац. інтэграцыю, і сац. развіццё. Да пераймання ён зводзіў розныя працэсы: сацыялізацыю як перайманне дзіцем дарослых, звычаі як перайманне традыц. узораў, моду як перайманне ўнутр. да знешняга і да т.п. Да фундаментальных сац. працэсаў адносіў таксама адаптацыю, важнейшым элементам і формай якой лічыў вынаходства. Лічыў, што ў выніку ўзаемадзеяння прыхільнікаў процілеглых вынаходстваў у грамадстве фарміруецца апазіцыя ў выглядзе сац. канфліктаў. Псіхал. канфлікты Т. разглядаў як сутыкненне процілеглых ідэй і матываў унутры свядомасці індывіда і лічыў, што вынікам такога канфлікту могуць быць вынаходствы, што спрыяюць адаптацыі да сац. асяроддзя. Па меры прасоўвання ад маральных з'яў да эканам., а затым да паліт. сукупнасць прадметаў і з'яў, што здольны выклікаць канфлікты, імкнецца да змяншэння, але пры гэтым інтэнсіўнасць канфліктных узаемадзеянняў нарастае. Такую анамалію тлумачыў ступенню сац. прыстасаванняў, неабходных, каб інавацыя ўзнікла і рэалізавалася ў адпаведных сферах грамадства. У тлумачэнні сац. працэсаў імкнуўся выкарыстоўваць эмпірычныя паказчыкі, у прыватнасці, сац. статыстыку.

Тв.: Рус. пер. — Преступления толпы. Казань, 1893; Общественное мнение и толпа. М., 1902; Социальные законы. СПб., 1906.

Я.М.Бабосаў.

ТАРДЭСІЛЬЯ́СКІ ДАГАВО́Р 1494, пагадненне паміж Іспаніяй і Партугаліяй аб падзеле сфер калан. захопаў у Зах. паўшар'і, заключанае 7 чэрв. ў г. Тардэсільяс (Іспанія). Дагавор удакладняў лінію падзелу, што станавілі былы рым. папы ад 1493. Паводле Т.д. дэмаркацыйная лінія праходзіла праз абодва полюсы Зямлі і перасякала Атлантычны ак. на адлегласці 370 ліг (больш за 2 тыс. км) ад самай зах. часткі а-воў Зялёнага Мыса (каля зах. ўзбярэжжа Афрыкі). Землі на У ад гэтай лініі прызнаваліся ўладаннямі Партугаліі, на З ад яе — Іспаніі. Т.д. скасаваны ў 1777.

ТАРЖО́К, горад у Цвярской вобл. Расіі, на р. Цверца (прыток р. Волга). Вядомы з 1139. 50,2 тыс. ж. (1999). Вузел чыгунак. Прам-сць: машынабудаванне і металаапр. (вагонабуд. і маш.-буд. з-ды), харч., гарбарна-абутковая. Дрэваапр. прадпрыемствы. З-д паліграф. фарбаў, золатавышывальная ф-ка, вытв-сць гліняных лялек. Музеі: гіст.-этнагр., арх.-этнагр. «Васілёва», залатога шыцця, А.С.Пушкіна. Драўляная царква Ушэсця (17—18 ст.), Барысаглебскі манастыр з аднайм. саборам (1785—86), Спаса-Праабражэнскі сабор (19 ст.).

ТАРКАВА́НКА, традыцыйная бел. страва, тое, што *бабка*.

ТАРКАЧЫ́, вёска ў Дзятлаўскім р-не Гродзенскай вобл. Цэнтр сельсавета і с.-г. калект. прадпрыемства. За 23 км на ПнУ ад г. Дзятлава, 168 км ад Гродна, 10 км ад чыг. ст. Наваельня. 363 ж., 138 двароў (2002). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ТАРКВЕМА́ДА, Таркемада (Torquemada) Томас дэ (каля 1420, г. Вальядалід, Іспанія — 16.9.1498), кіраўнік іспанскай інквізіцыі. Манах-дамініканец, у 1460—82 прыёр кляштара ў Сеговіі. Духоўнік каралевы *Ізабелы*, назначаны ў 1483 вял. інквізітарам Кастыліі і Арагона, у 1486 — таксама Валенсіі і Каталоніі. Склаў інквізіцыйны кодэкс і працэдуру інквізіцыйнага суда, распрацаваў арганізац. структуру органаў інквізіцыі. Вызначаўся выключнай жорсткасцю, увёў у масавую практыку *аўтадафэ* (пры ім было пакарана смерцю больш за 10 тыс. чал.). Ініцыятар праследаванняў мусульман і яўрэяў (дамогся выгнання апошніх з Іспаніі ў 1492).

ТАРКВІ́НІІ (лац. Tarquinii, этрускае Tárchuna), старажытны этрускі горад на Пн ад Рыма (цяпер тэр. г. Таркуінія ў Італіі). Археал. раскопкамі выяўлены рэшткі этрускіх паселішчаў 8 ст. да н.э. Захаваліся руіны абарончых сцен 5—4 ст. да н.э., саркафагі, аздобленыя скульптурамі, тэракотавыя рэльефы вял. храма і размалёўкі ў падземных магільных скляпах (7—1 ст. да н.э.). Мяркуюць, Т. былі паліт. і рэліг. цэнтрам федэрацыі 12 этрускіх гарадоў. Пасля войнаў 359—351 і 310—308 да н.э. з Рымам Т. страцілі самастойнасць.

ТАРКВІ́НІЙ ГО́РДЫ Луцый (Lucius Tarquinius Superbus), апошні (сёмы) цар Стараж. Рыма [534/533—510/509 да н.э.] этрускай дынастыі. Сын цара Тарквінія Прыска. Жорсткае кіраванне (не лічыўся з меркаваннямі *сената*, арганізоўваў канфіскацыі і пакаранні смерцю) і бясчынствы Т.Г. і яго сваякоў выклікалі паўстанне ў Стараж. Рыме, у выніку якога Т.Г. выгнаны, этрускае ўладанне скончылася, царскі лад скасаваны і ўтворана рэспубліка. *А.Г.Зельскі.*

ТАРКО́ЎСКІ Андрэй Арсеневіч (4.4.1932, Масква — 6.12.1986), расійскі кінарэжысёр, сцэнарыст; буйнейшы майстар сусв. кіно. Сын А.А.*Таркоўскага*. Скончыў Усесаюзны дзярж. ін-т кінематаграфіі (1961). Дэбютаваў фільмам «Каток і скрынка» (1960). Цэнтр. тэма творчасці Т. — набыццё чалавекам духоўнай цэльнасці праз веру, любоў і пакаянне. Яго фільмам характэрны шырыня і паэтычнасць мыслення, высокая выяўл. культура, спалучэнне рэаліст. дакладнасці з метафарычнай вобразнасцю і ўмоўнасцю. У фільме «Іванава дзяцінства» (1962, прыз «Залаты леў» Міжнар. кінафестывалю ў Венецыі; гал. прэміі Міжнар. кінафестываляў у Сан-Францыска і Акапулька) кантрастна спалучаны светлыя ўспаміны пра дзяцінства падлетка і жорсткі свет вайны. Фільм «Андрэй Рублёў» (1966, прэмія Міжнар. кінафестывалю ў Канах) — гіст. фрэска 15 ст. часоў татара-мангольскага нашэсця на Расію — сцвярджае бессмяротв-

насць твораў чалавека духу. У фільмах «Салярыс» (1972, спец. прыз Міжнар. кінафестывалю ў Канах) і «Сталкер» (1980, прэміі Міжнар. кінафестываляў у Трыесце і Мадрыдзе) у метафарычным плане разглядаюцца праблемы мэты і сэнсу чалавечага жыцця, пошукаў ісціны. Стужка «Люстра» (1975) — лірыка-біягр. споведзь мастака пра сям'ю, дзяцінства на фоне гіст. падзей, адлюстраванне мінулага ў цяперашнім. З 1982 працаваў за мяжой. У фільме «Настальгія» (1983, Італія, Вял. прыз Міжнар. кінафестывалю ў Канах) створаны вобраз «чалавека-свечкі», які імкнецца служыць людзям. «Ахвярапрынашэнне» (1986, Швецыя, Вял. спец. прыз Міжнар. кінафестывалю ў Канах) — аўтарскае бачанне місіі мастака ў сусвеце: выратаванне чалавецтва ад экалаг., тэхнал. і маральнай катастрофы. Ленінская прэмія 1990. З 1993 на Маскоўскім міжнар. кінафестывалі прысуджаецца прэмія імя Т.

Літ.: Зак М.Х. Андрей Тарковский: Творч. портрет. М., 1988; Михалкович В.И. Андрей Тарковский. М., 1989; О Тарковском. М., 1989; Мир и фильмы Андрея Тарковского. М., 1991; Туровская М. 7 $^1/_2$, или Фильмы Андрея Тарковского. М., 1991; Тарковская М.А. Осколки зеркала. М., 1999; Болдырев Н. Сталкер, или Труды и дни Андрея Тарковского. Челябинск, 2002.

В.Ф. Нячай.

ТАРКО́ЎСКІ Арсеній Аляксандравіч (12.6.1907, г. Кіраваград, Украіна — 27.5.1989), рускі паэт, перакладчык. Скончыў Вышэйшыя літ. курсы ў Маскве (1929). Друкаваўся з 1926. Першая кніга паэзіі — «Перад снегам» (1962). У зб-ках «Зямлі — зямное» (1966), «Чарадзейныя горы» (1978), «Зімовы дзень» (1980), «Ад юнацтва да старасці» (1987) і інш. сцверджанне цэласнасці духоўнага жыцця чалавека, успрынятае надзённага ў кантэксце агульначалавечага, ант. і біблейская сімволіка, усх. матывы, тэмы паэта і паэзіі, кахання. Паэзіі Т. ўласцівы напружаная філасафічнасць, маштабнасць, шчырасць. Аўтар артыкулаў пра паэзію і праблемы маст. перакладу, рэцэнзій. Перакладаў з арм., груз., арабскай і інш. моў. Дзярж. прэмія Каракалпакіі 1967. Дзярж. прэмія Туркменістана 1971. Дзярж. прэмія СССР 1989 (пасмяротна).

Тв.: Избранные стихотворения, поэмы, переводы, 1929—1979. М., 1982; [Избранное.] М.; Смоленск, 2000.

А.В.Спрынчан.

ТА́РЛЕ Яўген Віктаравіч (8.11.1875, Кіеў — 6.1.1955), расійскі гісторык. Акад. АН СССР (1927). Акад. Нарвежскай акадэміі навук і л-ры, чл.-кар. Брытанскай акадэміі для заахвочвання гіст.-філас. і філал. навук. Скончыў Кіеўскі ун-т (1896). З 1903 прыват-дацэнт, з 1917 праф. Петраградскага і Маскоўскага ун-таў. Адначасова ў 1913—18 праф. Юр'еўскага (г. Тарту, Эстонія) ун-та. У 1930—34 рэпрэсіраваны. Аўтар прац па гісторыі Францыі і міжнар. адносін новага часу, гісторыі Расіі. Асн. працы: «Рабочы клас у Францыі ў эпоху рэвалюцыі» (т. 1—2, 1909—11), «Кантынентальная блакада» (т. 1—2, 1913—16), «Жэрміналь і прэрыяль» (1937), «Нашэсце Напалеона на Расію, 1812 г.» (1938), «Крымская вайна» (т. 1—2, 1941—43), «Рускі флот і знешняя палітыка Пятра I» (1949) «Паўночная вайна і шведскае нашэсце на Расію» (выд. 1958) і інш. Аўтар гіст. біяграфій «Напалеон» (1936), «Талейран» (1939). Дзярж. прэмія СССР 1942, 1943, 1946.





Арсеній Аляксандравіч Я.В.**Тарле**. **Таркоўскі**.

ТАРЛО́ЎСКІ Васіль Іванавіч (14.8.1902, в. Ачыжа Чэрвеньскага р-на Мінскай вобл. — 3.10.1990), Герой Сав. Саюза (1944). Скончыў Мінскі пед. ін-т (1940), курсы нам. камандзіраў рот па паліт. частцы (1943) і ўдасканалення каманднага саставу. У Вял. Айч. вайну з 1941 на Паўд., Данскім, Варонежскім, Цэнтр. і 1-м Прыбалт. франтах. Стралк. рота на чале са старшым лейт. Т. вызначылася ў чэрв. 1944 пры прарыве абароны праціўніка ў Сіроцінскім (цяпер Шумілінскі) р-не Віцебскай вобл. і фарсіраванні Зах. Дзвіны, дзе захапіла і ўтрымлівала плацдарм да падыходу гал. сіл дывізіі. Да 1953 у Сав. Арміі, потым на выкладчыцкай рабоце.

ТАРМАЖЭ́ННЕ ў фізіялогіі, актыўны нервовы працэс, які прыгнечвае або прадухіляе *ўзбуджэнне*. Адбываецца пры ўзаемадзеянні *медыятара* з постсінаптычнай *мембранай* шляхам гіперпалярызацыі, якая зніжае ўзбудлівасць. Існуюць медыятары, здольныя выклікаць працэсы Т. і ўзбуджэння (напр., ацэтылхалін), медыятары Т. (напр., гліцын у спінным мозгу) і тармазныя нейроны (напр., клеткі Рэншоу спіннога мозга). Адрозніваюць Т. перыферычнае (адбываецца ў *сінапсах* на мышачных і залозістых клетках), цэнтральнае (рэалізуецца ў межах ц.н.с.), прэсінаптычнае і постсінаптычнае (у міжнейронных сінапсах), безумоўна- і ўмоўнарэфлекторнае (гл. *Вышэйшая нервовая дзейнасць*). Ва ўзбудлівых сінапсах Т. дзейнасці нейрона часам узнікае пад уплывам празмернага паступлення нерв. імпульсаў — песімальнае Т. (гл. *Парабіёз*). Ахоўнае Т. засцерагае нерв. цэнтры ад моцнага раздражнення або ператамлення. Складаныя каардынацыйныя ўзаемадзеянні паміж Т. і ўзбуджэннем — аснова нармальнай дзейнасці органаў і тканак, фарміравання паводзінскіх звычак у працэсе выспявання арганізма, эвалюцыі аналітычна-сінт. дзейнасці мозга.

Літ.: Анохин П.К. Внутреннее торможение как проблема физиологии. М., 1958; Судаков К.В. Общая теория функциональных систем. М., 1984.

С.С.Ермакова.

ТАРМАЗНО́Е ВЫПРАМЯНЕ́ННЕ, электрамагнітнае выпрамяненне, якое ўзнікае пры рассеянні (тармажэнні) зараджаных элементарных часціц у эл. полі.

Інтэнсіўнасць Т.в. паводле класічнай электрадынамікі прапарцыянальная квадрату паскарэння часціцы, якое адваротна прапарцыянальнае яе масе. Таму інтэнсіўнасць Т.в. электронаў у мільёны разоў большая за інтэнсіўнасць Т.в. пратонаў. *Спектр* Т.в. неперарыўны і абрываецца пры найб. магчымай энергіі, роўнай пач. энергіі электрона. Тармазное рэнтгенаўскае і гама-выпрамяненне, вылучаныя хуткімі электронамі пры іх рассеянні ў эл. полі атамных ядраў і электронаў у рэчыве, выкарыстоўваюцца ў тэхніцы, медыцыне, у даследаваннях па біялогіі, хіміі і фізіцы. Часам да Т.в. адносяць магнітатармазное выпрамяненне рэлятывісцкіх зараджаных часціц, якія рухаюцца ў макраскапічных магн. палях паскаральнікаў (гл. *Сінхратроннае выпрамяненне*).

А.А.Богуш.

ТАРМА́САЎ Аляксандр Пятровіч (1752—25.11.1819), расійскі ваенны і дзярж. дзеяч. Ген. ад кавалерыі (1801). Граф (1816). Удзельнік рус.-тур. вайны 1787—91. У час *паўстання 1794* атрад рас. войск на чале з Т. быў разбіты 4 крас. А.Т.*Касцюшкам* каля Рацлавіц. З 1803 кіеўскі, з 1807 рыжскі ваен. губернатар. У 1808—11 галоўнакамандуючы ў Грузіі і на Каўказскай лініі, кіраваў баявымі дзеяннямі ў рус.-тур. 1806—12 і рус.-іранскай 1804—13 войнах. У 1812 камандаваў 3-й Зах. арміяй, войскі якой у *Кобрынскім баі 1812* нанеслі паражэнне часцям саксонскага корпуса ген. Ж.Л.*Рэнье*, утрымалі свае пазіцыі ў *Гарадзечанскай бітве 1812*, але вымушаны былі адысці на Валынь. Пасля смерці П.І.*Баграціёна* часова камандаваў 2-й арміяй. У час восеньскага контрнаступлення рас. войск удзельнічаў у баях каля Малаяраслаўца, Вязьмы, Краснага. Вясной 1813 у час хваробы М.І.*Кутузава* выконваў абавязкі галоўнакамандуючага. У 1814—16 маскоўскі ваен. губернатар і галоўнакамандуючы, у 1816—19 маскоўскі ген.-губернатар.

А.М.Лукашэвіч.

ТАРМО́ЛА (Тармола-Мірскі) Раман Якубавіч (н. 5.4.1936, г.п. Мір Карэліцкага р-на Гродзенскай вобл.), бел. паэт. Скончыў Мінскі пед. ін-т (1960). У 1960—96 на Бел. тэлебачанні (у 1977—80 на кінастудыі «Беларусьфільм»). Друкуецца з 1957. Аўтар зб-каў паэзіі «Асколкі і росы» (1964), «Поўня» (1966), «Абнаўленне» (1968), «Міранка» (1971), «Побач» (1974), «Павага» (1976), «Вобразы вечара» (1982), «Толькі б дагаварыць...» (1986), «У прадчуванні святла...» (1992), паэм «Проста — я» (1966), «Навальнічны раён» (1969), «Ха-

тынскі рэквіем» (1971), «Вянок» (1972). У іх — лірызм, асацыятыўнасць, філас. роздум пра лёс народа ў Вял. Айч. вайну, паслявае. час, тэмы кахання, любві да роднага краю. Піша для дзяцей: зб-кі казак «Каго баяцца ў лесе» (1973), «Казкі-падказкі» (1984). Аўтар сцэнарыяў дакумент. фільмаў «Людзям сябе пакажы» (1973), «Я не самотны... Максім Багдановіч» (1982), дакумент.-маст. фільма «А мае міране добрыя людзі» (1993), тэлеспектакля «Зачараваны Валерка» (1976).

Тв.: Зямное — зямному. Мн., 1979; Спрадвечнасць. Мн., 1989; Зярняты з каласоў. Мн., 1994.

Літ.: Вярцінскі А. Высокае неба ідэалу. Мн., 1980; Семашкевіч Р. Выпрабаванне любоўю. Мн., 1982; Зуёнак В. Мера адкрытасці душы // Полымя. 1984. № 4; Арочка М. Балючая памяць зямлі // Там жа. № 7.

І.У.Саламевіч.

ТАРНАБЖЭ́СКАЕ ВАЯВО́ДСТВА (Województwo Tarnobrzeskie), былая адм.-тэр. адзінка на ПдУ Польшчы. З 1999 у складзе *Падкарпацкага ваяводства*.

ТАРНАГРО́ДСКАЯ КАНФЕДЭРА́ЦЫЯ, саюз шляхты (пераважна сярэдняй) Польшчы, накіраваны супраць абсалютысцкіх планаў караля польскага і вял. князя ВКЛ Аўгуста II Моцнага (адначасова курфюрст саксонскі). Абвешчана 26.11.1715 у г. Тарноград (Люблінскае ваяв.) на чале з С.Ледухоўскім. Канфедэраты ставілі за мэту вывад саксонскіх войск з Рэчы Паспалітай, дэтранізацыю Аўгуста II і замацаванне шляхецкіх вольнасцей. Саюзнік Аўгуста II у Паўночнай вайне 1700—21 цар Пётр I, не жадаючы ўмацавання ўлады караля, падтрымаў Т.к. і ўвёў у Рэч Паспалітую войскі. Шляхта ВКЛ у падтрымку Т.к. ў 1716 стварыла *Віленскую канфедэрацыю*. Атрады канфедэратаў змагаліся з каралеўскімі і саксонскімі войскамі на ўсёй тэр. Рэчы Паспалітай. 3.11.1716 пад націскам дыпламатаў Расіі ў Варшаве падпісана кампраміснае пагадненне паміж Аўгустам II, Т.к. і Віленскай канфедэрацыяй. 30.1.1717 пагадненне ратыфікавана і 1.2.1717 зацверджана «Нямым» соймам. Саксонскія войскі выводзіліся па-за межы Рэчы Паспалітай, улада караля абмяжоўвалася. Абмяжоўваліся і правы гетманаў, кароннае (польскае) войска скарачалася да 18 тыс. чал., а войска ВКЛ — да 6 тыс. Узмацніўся паліт. ўплыў Расіі на ўнутр. справы Рэчы Паспалітай.

А.П.Грыцкевіч.

ТАРНА́ДА (ісп. tornado), назва *смерчаў* над сушай у ЗША. Адрозніваюцца вельмі частай паўтаральнасцю (у параўнанні з еўрап. *тромбамі*). Штогод у бас. р. Місісіпі і на ПдУ краіны назіраецца некалькі соцень Т.

ТА́РНАЎ (Tarnów), горад на Пд Польшчы, у Малапольскім ваяводстве. Каля 140 тыс. ж. (2001). Чыг. ст., вузел аўтадарог. Прам-сць: хім. (вытв-сць азотных угнаенняў, палімераў), эл.-тэхн., станкабуд., шкляная, харчовая. Арх. помнікі 15—16 ст.: гатычны сабор, ратуша.

ТА́РНАЎСКАЕ ВАЯВО́ДСТВА (Województwo Tarnowskie), былая адм.-тэр. адзінка на Пд Польшчы. З 1999 у складзе *Малапольскага ваяводства*.

ТАРНО́ВА, вёска ў Лідскім р-не Гродзенскай вобл., на р. Дзітва. Цэнтр сельсавета і абл. унітарнага с.-г. прадпрыемства. За 18 км на ПдЗ ад г. Ліда, 100 км ад Гродна, 3 км ад чыг. ст. Белагруда. 740 ж., 272 двары (2002). Сярэдняя школа, Палац культуры, б-ка, бальніца, амбулаторыя, аптэка, Дом быту, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Помнік архітэктуры — сядзіба (канец 19 — пач. 20 ст.).

ТАРНО́ЎСКІ Уладзімір Мікалаевіч (н. 17.1.1947, г. Ужгарад Закарпацкай вобл., Украіна), бел. архітэктар. Скончыў Львоўскі політэхн. ін-т (1970). У 1970—87 і з 1996 працуе ў ін-це «Мінскпраект», у 1987—89 — у ін-це «Белдзяржпраект». У 1989—96 кіраўнік персанальнай творчай майстэрні. Асн. работы (у сааўт.): у Мінску — комплекс жылых дамоў для Бел. ваен. акругі па Старавіленскім тракце (1974—80), студэнцкі інтэрнат ін-та нар. гаспадаркі (цяпер Бел. эканам. ун-т) па вул. Ванеева (1975), Дзярж. муз. т-р Беларусі (1980), помнік А.С.Пушкіну і ландшафт навакольнага асяроддзя (1999); жылы гарадок *Рось* (Дзярж. прэмія Беларусі 1998); рэканструкцыя Рэзідэнцыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Дразды» пад Мінскам (1997) і будынка Нац. банка Беларусі па вул. Леніна (2000). Сярод інш. работ: забудова мікрараёна «Тарон-4» у г. Ванадзор (Арменія; 1992), жылы дом па вул. Леніна ў Астане (1998).

ТАРО́НТА (Toronto), горад на У Канады. Адм. цэнтр прав. Антарыо. Засн. ў 1749 як франц. гандл. пост. 4,7 млн. ж. разам з прыгарадамі і суседнімі гарадамі (2000). Вузел чыгунак і аўтадарог, порт на воз. Антарыо. Міжнар. аэрапорт. Важнейшы гандл.-прамысл., фін. і культ. цэнтр Канады; выпускаецца каля 25% прамысл. прадукцыі краіны. Прам-сць: агульнае машынабудаванне, металаапр., эл.-тэхн., радыёэлектронная, паліграф., хім., гумавая, фармацэўтычная, гарбарна-абутковая, швейная. Метрапалітэн. Ун-ты. Каралеўскі музей Антарыо. Маст. галерэя. Арх. помнікі 19 ст. Паблізу АЭС.

Беларусы ў Таронта. На працягу 20 ст., асабліва пасля 2-й сусв. вайны, у Т. склаўся адзін з гал. асяродкаў бел. дыяспары ў Канадзе. Да 1940-х г. сярод выхадцаў з Беларусі тут не было трывалага нац.-культ. і рэліг. жыцця, яно актывізавалася пасля заснавання *Згуртавання беларусаў Канады* (ЗБК; 1948) і *Беларускага нацыянальнага аб'яднання* ў Канадзе (1952). Тут выдаваліся газ. «*Беларускі эмігрант*» (1948—54) і час. «*Баявая ўскалось*» (1954—81), з 1952 выходзіць газ. «*Беларускі голас*». Дзейнічалі бел. правасл. прыходы св. Ефрасінні Полацкай (1951—52) і св. Кірылы Тураўскага (1954—55), у 1959 утвораны Беларускі рэліг.-грамадскі цэнтр. У 1965 пры ЗБК створана *Згуртаванне беларускіх жанчын Канады*. Грамадскую і культ.-асв. працу таксама праводзяць *Каардынацыйны камітэт беларусаў Канады* (з 1966), *Беларускі інстытут навукі і мастацтва* ў Т., *Беларускі выдавецка-мастацкі клуб «Пагоня»* (абодва з 1967). У 1970—83 у Т. знаходзілася *Рада Беларускай Народнай Рэспублікі*. У горадзе прайшоў шэраг сустрэч беларусаў Паўн. Амерыкі. Дзейнічае бел. правасл. царква імя св. Ефрасінні Полацкай. Гл. таксама раздзел пра беларусаў у арт. *Канада*.

ТАРО́ПЕЦКА-ХО́ЛМСКАЯ АПЕРА́ЦЫЯ 1942, наступальная аперацыя сав. войск 3-й (ген.-лейт. М.А.Пуркаеў) і 4-й (ген.-палк. А.І.Яроменка) ударных армій Паўн.-Зах. (з 22 студз. ў складзе Калінінскага) фронту 9 студз. — 6 лютага, праведзеная на завяршальным этапе *Маскоўскай бітвы 1941—42* у Вял. Айч. вайну. Сав. камандаванне ставіла задачу сіламі гэтых армій разграміць групоўку праціўніка на стыку груп ням. армій «Поўнач» і «Цэнтр». 9 студз. сав. арміі перайшлі ў наступленне і прасунуліся на З на 25—30 км. У пач. лютага 3-я ўдарная армія выйшла на подступы да г. Вял. Лукі Пскоўскай вобл., 4-я ўдар-



Горад **Таронта** на берегах возера Антарыо.

ная — да гарадоў Веліж і Дзямідаў Смаленскай вобл., а яе 249-я стралк. дывізія прарвалася да Віцебска. Ням. камандаванне перакінула на гэты напрамак 4 пях. дывізіі з Зах. Еўропы, таму сав. войскі перайшлі да абароны. У выніку Т.-Х.а. Чырв. Армія прасунулася да 250 км, абышла з ПнЗ ржэўска-вяземскую, з Пд дзямянскую групоўкі праціўніка, стварыўшы ўмовы для іх разгрому; у лініі ням. фронту ўтварыліся т.зв. *Віцебскія «вароты»*. У наступленні на Віцебскім напрамку сав. войскам вял. дапамогу аказалі партызаны Суражскай партыз. зоны.

ТАРО́С РАСЛІ́Н, армянскі мастак-мініяцюрыст 2-й пал. 13 ст.; майстар *кілікійскай школы*. Працаваў у манастыры Рамкла. Захаваліся 7 падпісаных ім рукапісаў (1256—68), у т.л. т.зв. Малаційскае евангелле (1268). У яго творчасці выявіліся рысы новага для таго часу маст. мыслення, якое характарызавалася дакладнасцю кампазіцыі, яснасцю трактоўкі прасторы, што дасягалася праз элементы прамой перспектывы, багаццем арнаментыкі, вытанчанасцю каларыту, які гарманічна спалучаў яркія плямы лакальнага колеру са складанымі змешанымі тонамі, высакародствам і стрыманасцю вобразнага ладу, жыццёвай перакананасцю поз і характараў персанажаў. Іл. гл. да арт. *Кілікійская школа*.

ТАРО́СЫ, нагрувашчванні *лёду* на морах, рэках і азёрах. Утвараюцца ў выніку бакавога ціску ледзяных палёў адно на адно, пры расколванні лядовага покрыва вял. таўшчыні; выш. каля 10 м, у прыбярэжнай ч. да 20 м. Сярод форм Т. вылучаюць: бар'еры, грады, *рапакі*, стамухі (асобныя нагрувашчванні на мелі). Т. найб. пашыраны ва Усх.-Сібірскім і Чукоцкім м., у адкрытай ч. Паўн. Ледавітага ак. На рэках Т. ўтвараюцца ў час крыгаходу.

ТАРПА́Н, конь дзікі (Equus gmelini), млекакормячая жывёла роду коней сям. коневых атр. няпарнакапытных. Магчыма, дзікі продак некат. пародаў *коней свойскіх*; як свойская жывёла прыручана 5—6 тыс. г. назад. 2 падвіды Т.: стэпавы (E.g. gmelini) і лясны (E.g. silvaticus). Былі пашыраны ў Еўропе і Зах. Казахстане. Т. стэпавы вынішчаны ў 18—19 ст., Т. лясны — на пач. 19 ст. З 1930-х г. у Германіі і Польшчы працавалі над узнаўленнем Т. ляснога. У 1962 і 1968 з Польшчы на Беларусь завезены 5 асобін у Белавежскую пушчу.

Выш. ў карку Т. стэпавага да 137 см; Т. лясны драбнейшы. Склад цела дужы, масць шэрая. Уздоўж спіны чорная паласа, грыва і хвост чорныя. *Э.Р.Самусенка.*

ТАРПАТЫ́НА, тое, што *жывіца*.



Электрычная **тарпеда**: 1 — выбуховае рэчыва; 2 — узрывальнік; 3 — акумулятары; 4 — электрарухавік.

ТАРПЕ́ДА (ад лац. torpedo электрычны скат), самарухальны, сама- або тэлекіравальны падводны снарад цыгарападобнай формы, які нясе звычайны або ядз. баявы зарад. Прызначаны для паражэння падводных лодак і суднаў, надводных караблёў, разбурэння прычалаў, докаў і інш. аб'ектаў. Знаходзяцца на ўзбраенні падводных лодак, крэйсераў, процілодачных караблёў, эсмінцаў, тарпедных катэраў, процілодачных самалётаў і верталётаў. Калібр Т. да 550 мм, даўж. да 6,5 м і больш.

Адрозніваюцца па прызначэнні (процілодачныя, процікарабельныя і двухмэтавыя), носьбітах (карабельныя, авіяцыйныя), энергасілавых установах (цеплавыя, электрычныя), сістэмах кіравання (акустычныя, або саманаводныя, тэлекіравальныя па правадах, манеўравальныя па праграмах). Карабельныя Т. запускаюцца з тарпедных апаратаў. Авіяц. Т. маюць меншую масу і габарыты, часам стабілізуючае прыстасаванне або парашут; акустычныя — актыўную, пасіўную або кампашыраны ў марской авіяцыі (утваралі яе асобны від — тарпеданосную, ці мінна-тарпедную, авіяцыю) многіх дзяржаў у 1930—50-я г., найб. выкарыстоўваліся ў 2-ю сусв. вайну. Пасля 1945 будавалі таксама рэактыўныя Т.-бамбардзіроўшчыкі. З сярэдзіны 1950-х г. са стварэннем авіяц. ракет Т. паступова заменены ракетаносцамі. 2) Малы быстраходны баявы карабель (водаўмяшчальнасць да 400 т) для паражэння варожых караблёў і суднаў *тарпедамі* (тарпедны катэр). Пашыраны ў ВМФ (ВМС) многіх дзяржаў з 1-й сусв. вайны да 1970-х г., у СССР будаваліся да 1990, у т.л. тарпедныя катэры на падводных крылах і паветр. падушцы. Мелі малакаліберныя гарматы або кулямёты. *У.Я.Калаткоў.*



Тарпаны.

ТАРПЕ́ЙСКАЯ СКАЛА́ (Saxum Tarpeium), у Старажытным Рыме стромкі ўцёс з зах. боку Капіталійскага ўзгорка, з якога скідвалі асуджаных на смерць дзярж. злачынцаў. Паводле аднаго з паданняў, назва паходзіць ад імя Луцыя Тарпея, якога скінулі адтуль за апазіцыю цару *Ромулу*. Паводле другой версіі, Тарпеяй звалі дачкуваеначальніка Капіталійскай крэпасці Спурыя Тарпея, якая ў час вайны з *сабінамі* паказала ворагам патайны ход, за што паплацілася жыццём.

ТА́РСКІ (Tarski) Альфрэд (14.1.1901, Варшава — 26.10.1983), польска-амерыканскі логік і матэматык, адзін з заснавальнікаў *семантыкі лагічнай*. Скончыў Варшаўскі ун-т (1924), з 1926 яго дацэнт. З 1939 у ЗША, з 1942 у Гарвардскім ун-це, з 1946 праф. Каліфарнійскага ун-та. Лічыў логіку асновай усіх навук, гал. задача якой — вызначэнне дакладнага сэнсу тэрмінаў і выяўленне агульных заканамернасцей. Зрабіў знач-

бінаваную сістэму саманавядзення; цеплавыя — поршневы, турбінны або рэактыўны рухавік; электрычныя — крыніцу эл. энергіі, электрарухавік з пераўтваральнікам. Першыя Т. пабудаваны ў Вялікабрытаніі ў 1866, з 1870-х г. паступілі на ўзбраенне флатоў многіх краін. У 1927 створана першая сав. Т. У 1930-х г. з'явілася тарпеданосная авіяцыя.

ТАРПЕДАНО́СЕЦ, 1) баявы самалёт для паражэння ваен. караблёў і трансп. суднаў праціўніка авіяц. тарпедамі, для ўстаноўкі авіяц. марскіх мін. Т. былі

ны ўклад у распрацоўку алг. метадаў вылічэння прэдыкатаў, тэорый мностваў, мадэлей, матэм. логіку, логіку выказванняў. Сфармуляваў вызначэнне паняцця ісціны для большасці фармалізаваных моў. Аўтар прац па метадалогіі дэдуктыўных навук. Даследаванні Т. паўплывалі на развіццё *семіётыкі* і паслужылі ўзорам выкарыстання фармальных метадаў для аналізу змястоўных праблем і тэорый.

Тв.: Рус. пер. — Обоснование научной семантики // Филос. и социол. мысль. 1996. № 1—2; Понятие истины в языках дедуктивных наук // Философия и логика Львовско-Варшавской школы. М., 1999; Введение в логику и методологию дедуктивных наук. Биробиджан, 2000.

ТАРТА́К, Л у ч ы л а, возера ва Ушацкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Ушача (цячэ праз возера), за 20 км на ПдЗ ад г.п. Ушачы. Пл. 0,54 км^2, даўж. 1,76 км, найб. шыр. 500 м, найб. глыб. 11,4 м, даўж. берагавой лініі 4,4 км, пл. вадазбору 116 км^2. Катлавіна лагчыннага тыпу. Схілы выш. 6—9 м (на ПдУ 10—15 м), пад лесам. На ПнУ і ПдЗ пойма шыр. 100—150 м, парослая хмызняком. Берагі нізкія, пясчаныя, участкамі пад хмызняком, забалочаныя. Дно да глыб. 2 м пясчанае, ніжэй ілістае. Востраў пл. 0,1 га. Уздоўж берагоў паласа надводнай расліннасці. Ракой Ушача злучана з азёрамі Мурагі і Царкавішча.

ТА́РТАР, у старажытнагрэчаскай міфалогіі бездань, прастора, што знаходзіцца ніжэй за *аід*, як неба вышэй за зямлю. Лічылася, што ў Т. залягаюць карані зямлі і мора, усе канцы і пачаткі. Тут жыве *Нікта* — багіня ночы. Нават багі баяцца трапіць у Т., дзе зняволены пераможаныя Зеўсам *тытаны*. Паводле пазнейшых міфаў, Т. — самае аддаленае месца аіда, дзе нясуць пакаранне дзёрзкія героі: *Тантал, Сізіф*, Пірыфой і інш. *А.Г.Зельскі.*

ТА́РТУ (Tartu), горад на Пд Эстоніі. Каля 115 тыс. ж. (2001). Вузел чыгунак і аўтадарог, порт на р. Эмайыгі. Прам-сць: маш.-буд. і металаапр., хім., харч., тэкст., швейная, гарбарна-абутковая, дрэваапр., паліграфічная. *Тартускі універсітэт*, с.-г. акадэмія. Музеі. Тэатр. Арх. помнікі: сабор Пятра і Паўла (13—15 ст.), касцёл Яані (14 ст.), ратуша (18 ст.), комплекс будынкаў ун-та (19 ст.).

У 10—11 ст. на месцы Т. было паселішча стараж. эстаў Тарпату. Упершыню ў летапісах упамінаецца пад 1030 як г. Юр'еў, пабудаваны Яраславам Мудрым. У 1224 захоплены ням. крыжаносцамі і перайменаваны ў Дэрпт; цэнтр біскупства. У 1-й пал. 13 ст. атрымаў гар. права. У 13—16 ст. чл. *Ганзы*, пасрэднік у гандлі з Псковам і Ноўгарадам. У час Лівонскай вайны 1558—83 заняты рус. войскамі, з 1582 пад уладай Рэчы Паспалітай, з 1625 — Швецыі. У 1632 засн. ун-т. У Паўночную вайну 1700—21 заняты рус. войскамі (1704) і паводле *Ніштацкага мірнага дагавора 1721* далучаны да Расіі. З 1783 цэнтр павета Рыжскага намесніцтва (з 1796 — Ліфляндскай губ.). У 1893—1919 наз. Юр'еў, з 1919 — сучасная назва. У 1920 у Т. падпісаны мірны дагавор паміж Эстоніяй і РСФСР (гл. *Савецка-эстонскія пагадненні*). У 1919—40 і з 1991 у складзе незалежнай Эстоніі; у 1940—91 у Эст. ССР. У 2-ю сусв. вайну акупіраваны ням. фашыстамі (1941—44).

ТА́РТУСКІ ДАГАВО́Р, заключаны ў 1920 паміж РСФСР і Эстоніяй, гл. ў арт. *Савецка-эстонскія пагадненні.*

ТА́РТУСКІ УНІВЕРСІТЭ́Т. Адкрыты ў 1632 у г. Дэрпт (цяпер Тарту, Эстонія) паводле загаду шведскага караля Густава II Адольфа аб заснаванні Акадэміі Густавіяна. У сувязі з ваен. дзеяннямі працаваў з перапынкамі да 1710. У 1802 аднавіў дзейнасць (адзіны ў Рас. імперыі ун-т, дзе выкладанне вялося на ням. мове). З 1889 лекцыі чыталіся на рус. мове, з 1.12.1919 — на эстонскай. З 1893 у сувязі з перайменаваннем горада наз. Юр'еўскі, з 1919 — Тартускі. У 2001/02 навуч. г. больш за 15 тыс. студэнтаў і каля 900 выкладчыкаў; ф-ты: тэалагічны, юрыд., мед., філас., біёлага-геагр., фізіка-хім., эканам., матэматыка-інфарм., сац. навук, адукацыі, фіз. культуры. Пры ун-це працуюць 3 каледжы.

ТАРТЭ́ЛА (Tortella), род брыевых імхоў сям. трыхастомавых. 37 відаў. Пашыраны ўсюды. На Беларусі Т. звілістая (T. tortuosa), занесеная ў Чырв. кнігу. Трапляецца ў ельніках, на вапнава-пясчанай гальцы, на сценах старых бетонных збудаванняў.

Шматтадовыя, адна- ці двухдомныя, наглебавыя або наскальныя імхі. Сцёблы прамастойныя, простыя ці вілавата разгалінаваныя, выш. 0,5—10 см. Лісце даўж. да 8 мм, адыходнае, яйцападобна-ланцэтнае, лінейнае, хвалістае, завостранае або тупаватае. Спарагоній верхавінкавы, з падоўжанай ножкай. Каробачка прамастойная ці нахіленая, прамая або сагнутая. Вечка з дзюбкай.



Тартэла звілістая.

ТАРУ́НСКАЕ ВАЯВО́ДСТВА (Województwo Toruńskie), былая адм.-тэр. адзінка на Пн Польшчы. З 1999 у складзе *Куяўска-Паморскага ваяводства.*

ТАРУ́НСКІ МІР 1411, мірны дагавор паміж *Тэўтонскім ордэнам* з аднаго боку і Польскім каралеўствам і ВКЛ з другога, падпісаны 1 лют. ў г. *Торунь*. Завяршыў *Вялікую вайну 1409—11*. Пасля *Грунвальдскай бітвы 1410* Тэўтонскі ордэн рыхтаваўся да рэваншу. Польскі кароль *Ягайла* і вял. кн. ВКЛ *Вітаўт* перад пагрозай вайны на 2 фронты (з ордэнам і яго саюзнікам герм. імператарам Зыгмунтам Люксембургскім) пагадзіліся на часовае прымірэнне з Тэўтонскім ордэнам, які паводле Т.м. адмовіўся ад *Жамойці* і яцвяжскіх земель на карысць ВКЛ (толькі на перыяд жыцця Ягайлы і Вітаўта), а Польшчы вярнуў Добжыньскую зямлю і абавязаўся выплаціць 100 тыс. коп чэш. грошаў. Палавінчаты характар Т.м. абумовіў далейшае нарастанне напружанасці паміж яго ўдзельнікамі і іх падрыхтоўку да новай вайны. *Г.М.Сагановіч.*

ТАРУ́НСКІ МІР 1466, мірны дагавор паміж *Тэўтонскім ордэнам* і Польшчай, падпісаны 19 кастр. ў г. *Торунь*. Завяршыў *Трынаццацігадовую вайну 1454—66*. Тэўтонскі ордэн прызнаваў сябе васалам польскага караля і перадаваў непасрэдна ў склад Польшчы Гданьскае Памор'е, Хэлмскую зямлю, землі па Вісле з *Мальбаркам* і Эльблангам, *Вармію*. Самастойнасць знешняй палітыкі ордэнскай дзяржавы абмяжоўвалася. Кожны новаабраны вял. магістр ордэна мусіў прысягаць на вернасць польскаму каралю і абяцаць захоўваць пастановы Т.м.; ён уваходзіў у склад польскага сената. *Г.М.Сагановіч.*

ТАРФЯ́НА-БАЛО́ТНЫЯ ГЛЕ́БЫ, група глеб, якія развіваюцца пры працягламу залішнім увільгатненні атм. і грунтавымі водамі ва ўмовах балотнага глебаўтваральнага працэсу. Пашыраны ва ўмерана вільготным клімаце Паўн. паўшар'я, асабліва ў Зах. Сібіры, на Д.Усходзе, Пн і ПнЗ Расіі, Украіне. На Беларусі (найб. у Брэсцкай, Гомельскай, Мінскай абл.) займаюць 14,1% с.-г. угоддзяў (2,9 млн. га). Характарызуюцца перавагай назапашвання арган. рэчыва над яго распадам, што вядзе да ўтварэння *торфу* і агляення мінер. ч. глебы.

У залежнасці ад паходжання, расліннасці і ўмоў воднага жыўлення Т.-б. г. падзяляюцца на нізінныя (слабашчолачныя, багатыя азотам і попельнымі элементамі), вярховыя (кіслыя, бедныя азотам, малапопельныя), поймавыя (алювіяльныя); глебы пераходных балот, больш блізкія да вярховых. Паводле магутнасці торфу вылучаюць тарфяніста-глеевыя (слой торфу да 30 см), тарфяна-глеевыя (30—50 см), тарфяна-балотныя маламагутныя (50—100 см), сярэднемагутныя (100—200 см) і магутныя (больш за 200 см). У цалінным стане Т.-б. г. выкарыстоўваюцца як сенажаці невысокай якасці. Нізінныя і поймавыя глебы — аб'ект *меліярацыі*, у выніку чаго мяняюцца працэсы глебаўтварэння (балотны працэс спыняецца, распадаецца арган. рэчыва і глеба абагачаецца попельнымі элементамі жыўлення раслін). На асушаных Т.-б. г. вырошчваюць адна- і шматтадовыя травы, прапашныя культуры. Паводле баніціровачнай шкалы Беларусі ўрадлівасць Т.-б. г. да 78 балаў.

ТАРФЯНА́Я ПРАМЫСЛО́ВАСЦЬ, галіна *паліўнай прамысловасці* па здабычы і перапрацоўцы *торфу*. Асн. прадукцыя: фрэзерны і кускавы торф, тарфяныя брыкеты, арган. ўгнаенні, торф на подсціл с.-г. жывёле і для хім. перапрацоўкі.

На Беларусі прамысл. здабыча торфу пачалася ў 1896 для патрэб шклозавода ў в. Серкавіца (Талачынскі р-н Віцебскай вобл.), у 1899 — паблізу г. Гомель для гомельскіх цагельняў. Торфабрыкет пачалі выраблять у 1900 на торфараспрацоўцы каля в. Шэбрын (Брэсцкі р-н). Да 1913 арганізаваны торфараспрацоўкі радовішчаў Дымаўшчына (каля г. Віцебск), Гразкі (Гомельскі р-н), Котуш (каля г. Магілёў), пры шклозаводзе «Труды» (Полацкі р-н), Ноўка (Віцебскі р-н), пад Мінскам. У 1920—40 дзейнічала больш за 200 торфапрадпрыемстваў. У 1940 здабыта 3,4 млн. т торфу, яго ўдз. вага ў паліўным балансе рэспублікі склала 63,5%. У 1950—60 пабудаваны буйныя прадпрыемствы Т.п.: «Светлагорскае» і «Васілевіцкае» ў Гомельскай, «Рэдкі Рог» і «Дняпроўскае» ў Магілёўскай, «Бярозаўскае» ў Брэсцкай, «40 гадоў БССР» у Гродзенскай, «Бярэзінскае», «Смалявіцкае», «Чысцік» у Мінскай, «Дабееўскі Мох», «Віцебскае» і інш. ў Віцебскай абл. Да 1960 торф заставаўся асн. відам паліва, на ім працавала большасць ДРЭС і ЦЭЦ, яго ўдз. вага ў паліўным балансе склала 39,5%. З канца 1970 у сувязі з выкарыстаннем больш эфектыўных відаў паліва (нафтапрадукты, прыродны газ) здабыча торфу на паліўна-энергет. мэты змяншаецца, удз. вага ў паліўным балансе 0,8% (1985). Адначасова расце здабыча торфу для патрэб сельскай гаспадаркі. У 2000 у Рэспубліцы Беларусь 37 прадпрыемстваў Т.п., найб. значныя: «Каўпеніца», «Бярозаўскае», «Кобрынскае» ў Брэсцкай, «Асвейскае», «1 Мая», «Усвіж-Бук» у Віцебскай, «Луцкі», «Хойніцкі» ў Гомельскай, «Дзітва», «Лідскі», «Ашмянскі» ў Гродзенскай, «Рэдкі Рог» «Татарка», «Ганчанскае» ў Магілёўскай, «Усяж», «Сяргеевіцкае», «Слуцкае» ў Мінскай абл.

Т.п. найб. развіта ў Расіі, Польшчы, Германіі, Швецыі, Ірландыі. Гл. таксама *Торфаздабыча, Тарфяны кадастр.* *П.І.Рогач.*

ТАРФЯНЫ́ КАДА́СТР, сістэматызаваны збор колькасных і якасных уліковых звестак пра тарфяныя радовішчы. На Беларусі першыя Т.к. выдадзены ў 1940 і 1953 (перавыдадзены ў 1978). У іх змешчаны характарыстыкі радовішчаў: кадастравы нумар, назва, адлегласць ад раённага цэнтра, бліжэйшай чыг. станцыі і нас. пунктаў, пл. радовішча ў нулявых і прамысл. межах, найб. і сярэдняя глыб. торфу, яго запасы і якасныя паказчыкі (тып, ступень распаду, попельнасць, пністасць), пл. асушэння, землекарыстальнікі, від выкарыстання, водапрыёмнік, від і год разведкі, катэгорыя вывучанасці, наяўнасць сапрапелю, мергелю, падсцілачных тарфоў. Змешчаны таксама абагульняльныя звесткі па тарфяным фондзе раёнаў і абласцей, размеркаванне радовішчаў па памерах і інш. Т.к. перыядычна абнаўляецца і дапаўняецца. *П.І.Лабанок.*

ТАРФЯНЫ́ ПАЖА́Р, разнавіднасць ландшафтных *пажараў*, якая характарызуецца бясполымным гарэннем тарфянога слоя глебы. Узнікаюць стыхійна ці ад неасцярожнага абыходжання з агнём пры адноснай вільготнасці нізіннага торфу да 69%, вярховага 72%. У ціхае надвор'е торф гарыць марудна, у ветранае — іскры перакідваюцца на сумежныя ўчасткі і Т.п. развіваецца лавінападобна. Вызначаецца ўстойлівасцю гарэння. Для прадухілення Т.п. праводзяць проціпажарныя мерапрыемствы: унясенне мінер. грунту ў слой торфу, меліярац. работы, стварэнне проціпажарных палос, траншэй, сажалак.

Таблiца

Здабыча торфу і вытворчасць торфабрыкетаў на Беларусі, тыс. т

	1990	1995	2000
Здабыча паліўнага торфу	3438	3145	2023
Здабыча торфу для сельскай гаспадаркі	12 304	961	188
Вытворчасць торфабрыкетаў	2071	1535	1257

ТАРФЯНЫ́ ФОНД, усе выяўленыя і разведаныя радовішчы *торфу*. У Рэспубліцы Беларусь у Т.ф. ўлічваюцца радовішчы плошчай не менш як 1 га (у межах прамысл. глыбіні тарфяных пакладаў). У адпаведнасці са «Схемай рацыянальнага выкарыстання і аховы тарфяных рэсурсаў Рэспублікі Беларусь на перыяд да 2010 года» (1988) Т.ф. Беларусі складаўся з 9191 радовішча з запасам 4,4 млрд. т. Усе радовішчы падзелены на мэтавыя фонды: прыродаахоўны — радовішчы на ахоўных прыродных тэрыторыях; земельны выкарыстоўваецца толькі ў с.-г. мэтах; запасны ўключае зарэзерваваныя радовішчы гідролізнай, бітумінознай, лячэбнай сыравіны; фонд, які распрацоўваецца — радовішчы, адведзеныя для здабычы торфу; фонд, які не выкарыстоўваецца — радовішчы на землях *лясного фонду* і інш.

Упершыню паняцце «Т.ф.» з'явілася ў пастанове СНК БССР (9.6.1922), паводле якой усе рэсурсы торфу перадаваліся ва ўласнасць дзяржаве, а кіраванне імі ўскладалася на Наркамзем БССР. У 1940 выдадзены першы на Беларусі *тарфяны кадастр*, у 1953 — даведнік «Тарфяны фонд Беларускай ССР». З 1952 кіраванне Т.ф. ажыццяўляла Гал. ўпраўленне тарфянога фонду пры Савеце Міністраў БССР, з 1988 — Дзярж. к-т БССР па ахове прыроды (Дзяржкамэкалогіі), Мін-ва прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя (Мінпрыроды).

У адпаведнасці з *Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб нетрах* (1997) Т.ф. можа выкарыстоўвацца з дазволу мясц. Саветаў дэпутатаў (у межах іх кампетэнцыі) пры наяўнасці ліцэнзіі Мінпрыроды. Адпрацаваныя ўчасткі тарфяных радовішчаў карыстальнік павінен прыводзіць у стан, прыдатны для далейшага іх мэтавага выкарыстання (с.-г. ўгоддзі, лясныя пасадкі, рыбаводства і інш.), пакідаючы прыродны (абаронены) пласт торфу не менш за 0,15—0,5 м у залежнасці ад прызначэння ўчастка. З мэтай аднаўлення ландшафтнай і біял. разнастайнасці выпрацаваныя тарфяныя радовішчы ў некаторых месцах зноў забалочваюцца. *М.А.Караткоў.*

ТАРФЯНЫ́Я МАШЫ́НЫ І КО́МПЛЕКСЫ, машыны і іх комплексы для асушэння і падрыхтоўкі тарфяных радо-



1



2



3

Тарфяныя машыны і комплексы: 1 — скрэперна-ўборачны агрэгат УМПФ-7; 2 — пнеўма-фрэзерны камбайн БПФ-2М; 3 — штабелявальная машына МТФ-71А (Гомельскі завод тарфянога машынабудавання).

вішчаў да распрацоўкі, для здабычы, сушкі і ўборкі торфу. Да іх адносяць тарфяныя *бункерныя камбайны, бункерныя ўборачныя машыны, валкавальнікі, дрэнажныя машыны, каналакапальнікі, карчавальныя машыны, прафілёўшчыкі, штабелявальныя машыны, экскаватары*, фрэзеры, варушылкі, зборшчыкі і пагрузчыкі пнёў і інш.

Машыны і механізмы на стадыях асушэння і падрыхтоўкі радовішча да эксплуатацыі і здабычы торфу аб'ядноўваюцца ў комплексы — камплекты індывід. і камбінаваных машын, узаемазвязаных па прадукцыйнасці. Напр., комплекс машын для здабычы фрэзернага торфу ўключае: бункерныя машыны (МТФ-43А) у камплекце з фрэзерамі (МТФ-13, -17), варушылкамі (МТФ-22), валкавальнікамі (МТФ-33Б) і штабелявальнымі машынамі (МТФ-71). Замена тарфянога паліва вадкім і газападобным скараціла аб'ёмы здабычы торфу і зменшыла выкарыстанне Т.м. і к. Ствараюцца машыны для атрымання бытавога кавалкавага паліва з торфу і сумесей торфу з гаручымі адходамі вытв-сці, механізмаў і абсталявання для яго перапрацоўкі.

На Беларусі ў 1960—80-я г. Гомельскі з-д тарфянога машынабудавання выпускаў штабелявальныя машыны, фрэзеры-валкавальнікі, тарфяныя гідраўл. пагрузчыкі і інш.; Мазырскі з-д меліярац. машын — каналакапальнікі, каналаачышчальнікі, карчавальнікі-збіральнікі; выпускае навясное абсталяванне карчавальніка, рыхліцеля і інш. Гл. таксама *Тарфяная прамысловасць*.

Б.А.Багатаў.

ТАРХА́Н (цюрк.), 1) назва ў цюрк. народаў у сярэднія вякі феадала (князя) і прадстаўнікоў некат. інш. сац. груп, што былі вызвалены ад падаткаў. 2) Землі і маёмасць феадалаў Закаўказзя, Сярэдняй Азіі, Казахстана, Астраханскага, Казанскага і Крымскага ханстваў, вызваленыя ад уплаты дзярж. падаткаў. 3) Разнавіднасць публічна-прававых актаў Маскоўскага вял. княства і Рас. дзяржавы 14 — канца 17 ст. Т. або тарханна-несудзімыя граматы вызначалі аб'ём падатковых (у «тарханнай» частцы) і суд. (у «несудзімай частцы») прывілеяў свецкіх і духоўных феадалаў, асобных карпарацый гар. або прамысл. насельніцтва.

ТАРХА́НАЎ (сапр. Масквін) Міхаіл Міхайлавіч (19.9.1877, Масква — 18.8.1948), расійскі акцёр, педагог, рэжысёр. Брат І.М.*Масквіна*. Нар. арт. СССР (1937). Д-р мастацтвазнаўства (1939). На сцэне з 1898 — акцёр правінцыяльных т-раў, у т.л. ў Мінску, Віцебску. З 1922 у Маскоўскім Маст. акад. т-ры. У 1942—48 маст. кіраўнік Дзярж. ін-та тэатр. мастацтва (з 1939 праф.). Мастацтва Т. вызначалася багаццем камедыйна-сатыр. фарбаў, выразнасцю акцёрскіх прыёмаў пры тонкім пранікненні ў сутнасць вобраза. Сярод роляў: Градабоеў, Дзікой («Гарачае сэрца», «Навальніца» А.Астроўскага), Сабакевіч («Мёртвыя душы» паводле М.Гогаля), Сямёнаў («У людзях» паводле М.Горкага), Фамусаў («Гора ад розуму» А.Грыбаедава), Фурначаў («Смерць Пазухіна» М.Салтыкова-Шчадрына), Лука («На дне» М.Горкага). Здымаўся ў кіно: «Навальніца», «Іудушка Галаўлёў», «Пётр І» і інш. З выпускнікоў яго курса ў ін-це тэатр. мастацтва створаны Брэсцкі абл. рус. драм. т-р (1940—41; падрыхтаваў з імі ў час вучобы спектаклі «Мяшчане» М.Горкага, «Любоў Яравая» К.Транёва і інш.). Дзярж. прэмія СССР 1943.

Літ.: Загорский М. М.М.Тарханов. М.; Л., 1946.



М.М.**Тарханаў**.



М.Л.**Тарывердыеў**.

ТАРЦІ́НІ (Tartini) Джузепе (8.4.1692, Пірана, Італія — 26.2.1770), італьянскі кампазітар, скрыпач, педагог, муз. тэарэтык; буйнейшы прадстаўнік італьян. скрыпічнай школы. У 1721—70 першы скрыпач сабора Сант-Антоніо ў Падуі, у 1723—25 — і ў Празе. Яго ігру вылучалі чысціня інтанацыі, багатая і развітая тэхніка. Развіў смыкавую тэхніку; жанр канцэрта для скрыпкі з арк. (усяго 125 канцэртаў) і скрыпічнай санаты (усяго 175). Аўтар тэарэт. «Трактата пра музыку» (1754), «Трактата пра ўпрыгожванні» (1771); адкрыў з'яву т.зв. камбінацыйных тонаў і інш. Заснавальнік Муз. акадэміі ў г. Падуя (1727). Сярод вучняў Д.Даль'Ока, П.Нардзіні.

Літ.: Гинзбург Л.С. Джузеппе Тартини. М., 1969.

Н.В.Сазановіч.



М.**Тарханаў** у ролі Лукі.

ТАРЫВЕРДЫ́ЕЎ Мікаэл Леонавіч (15.8.1931, Тбілісі — 4.7.1996), расійскі кампазітар. Засл. дз. маст. Расіі (1979). Нар. арт. Расіі (1986). Скончыў Муз.-пед. ін-т імя Гнесіных у Маскве (1957, кл. А.Хачатурана). Асн. сфера творчай дзейнасці: камерная музыка, муз. т-р, музыка да кінафільмаў. Сярод твораў: оперы «Граф Каліёстра», «Чаканне» (абедзве паст. 1985), балет «Дзяўчына і Смерць» (паст. 1987) і інш.; сімфонія для аргана «Чарнобыль» (1988), канцэрты для скрыпкі з арк. (1982) і для аргана «Касандра» (1986), вак. цыклы, песні; музыка да кіна- і тэлефільмаў (больш за 100), у т.л. «Кароль-алень» (1970), «Семнаццаць імгненняў вясны» (1973), «Іронія лёсу, ці з лёгкім парам» (1976). Дзярж. прэмія СССР 1977.

Літ.: Цукер А. М.Таривердиев. М., 1985.

Т.А.Дубкова.

ТАРЫ́ЙСКАЯ ПАРО́ДА, парода цяжказапражных коней. Выведзена ў 1-й пал. 20 ст. на Тарыйскім конным заводзе (Эстонія) з помесей мясц. эст. коней (клепер), арабскай, англ. чыстакроўнай, арлоўскай, *тракененскай пародай*; помесі скрыжоўвалі з жарабцамі пародаў нарфолкродстэр і пасцье-брэтон. Разводзяць у Прыбалтыйскіх краінах, Расіі, Беларусі. Выкарыстоўваюць у сельскай гаспадарцы, конным спорце, як транспарт.

Жывёлы сярэднебуйныя, шыракацелыя, мускулістыя. Выш. ў карку 153—163 см. Маса жарабцоў 580—700, кабыл 500—650 кг. Масць пераважна рудая ці бурая, з белымі меткамі на нагах.

ТА́РЫКАЎ Георгій Пятровіч (н. 24.10.1940, г. Саратаў, Расія), бел. вучоны ў галіне прыкладной механікі. Д-р тэхн. н. (1995). Скончыў Бел. ін-т інжынераў чыг. транспарту (1964), дзе і працаваў у 1973—76 і з 1980 (у 1982—87 заг. кафедры). З 1989 у Гомельскім тэхн. ун-це (з 1998 заг. кафедры). Навук. працы па метадах эл. мадэліравання задач механікі кантактнага ўзаемадзеяння. Стварыў арыгінальныя электрамадэліруючыя прыстасаванні, распрацаваў спосабы рашэння прасторавых кантактных задач для штампаў рознай геаметрычнай формы і з улікам т-ры і мех. зносу.

Тв.: Построение весовой функции для круговой трещины в упругом слое (разам з М.М.Барадачовым) // Докл. Нац. АН Беларуси. 1999. Т. 43, № 2; Электрическое моделирование пространственных контактных задач. Гомель, 2001.

ТАРЫ́М, рака на З Кітая; самая доўгая ў Цэнтр. Азіі. Утвараецца ад сутокаў рэк Яркенд, Аксу і Хатан, якія цякуць са схілаў Куньлуня, Каракарума, Цянь-Шаня, Паміра. Даўж. ад вытоку р. Яркенд 2030 км, пл. бас. каля 1 млн. км^2 (разам з бас. азёр Лабнор і Карабуранкёль). Сярэдняе і ніжняе цячэнне ў межах Тарымскай раўніны, дзе рака абгінае пустыню Такла-Макан, утварае лабірынт рэчышчаў і невял. азёр, мае складаную дэльту, агульную з р. Канчэдар'я. Жывіць папераменна азёры Лабнор і Карабуранкёль, што абумоўлівае

змену іх памераў і абрысаў. Разводдзе з мая да верасня. Сярэдні расход пры зліцці Аксу (дае 70—80% агульнага сцёку), Хатана і Яркенда 167 м³/с, ніжэй ён памяншаецца. Выкарыстоўваецца для арашэння Аксуйскага, Кашгарскага і Яркендскага аазісаў.

ТАРЫ́МСКАЯ РАЎНІ́НА, другая назва *Кашгарскай раўніны*.

ТАРЫ́РАВАННЕ (ад ням. tarieren), 1) устарэлая назва *градуіроўкі* сродкаў вымярэнняў, якая шырока ўжывалася да прылад, прызначаных для вымярэння неэл. велічынь. 2) Метад дакладнага ўзважвання з выкарыстаннем тарнага грузу (шрот, кавалачкі металу і інш.).

ТАРЫФІКА́ЦЫЯ, вызначэнне *тарыфу* на аснове класіфікацыі аб'ектаў абкладання ці аплаты (напр., Т. заработнай платы); вызначэнне (прысваенне) тарыфных разрадаў. Ажыццяўляецца на аснове тарыфна-кваліфікацыйнага даведніка. Адрозніваюць Т. работ — аднясенне розных па складанасці работ да пэўнага разраду *тарыфнай сеткі* і Т. рабочых — прысваенне ім адпаведных тарыфных разрадаў у залежнасці ад *кваліфікацыі* і *прафесіі* (спецыяльнасці).

ТАРЫ́ФНА-КВАЛІФІКАЦЫ́ЙНЫ ДАВЕ́ДНІК, нарматыўны дакумент, які змяшчае сістэматызаваны пералік работ у залежнасці ад іх кваліфікацыйных характарыстык (ступені дакладнасці, складанасці і адказнасці) і патрабаванняў да выканаўцаў гэтых работ у ведах, вытв. прыёмах, звычках і інш. Бываюць адзіныя для рабочых скразных прафесій і галіновыя (для рабочых, прафесія якіх уласцівая толькі пэўнай галіне).

ТАРЫ́ФНАЯ СЕ́ТКА, шкала, якая ў форме *тарыфных каэфіцыентаў* вызначае суадносіны *тарыфных ставак* работнікаў розных разрадаў; адзін з асн. элементаў *тарыфнай сістэмы*. З яе дапамогай робіцца дыферэнцыяцыя і рэгуляванне асн. часткі *заработнай платы* розных прафес.-кваліфікацыйных груп работнікаў у залежнасці ад значэння галіны эканомікі, складанасці, зместу і спецыфікі працы у рабочых, спецыялістаў, кіраўнікоў, агульных умоў працы. Складаецца з *тарыфных разрадаў* і тарыфных каэфіцыентаў, якія ім адпавядаюць.

На Беларусі колькасць разрадаў і міжразрадныя суадносіны тарыфных каэф. з часу ўвядзення «Адзінай тарыфнай сеткі Рэспублікі Беларусь» (студз. 1992) мяняліся некалькі разоў у залежнасці ад тарыфных ставак 1-га разраду, а таксама ў сувязі з інфляцыяй і фін. магчымасцямі дзяржавы. На 1.1.2002 існуе 27-разрадная сетка з суадносінамі паміж крайнімі разрадамі 1 : 7,84. Рабочыя ўсіх галін эканомікі размеркаваны з 1-га па 8-ы разрад уключна. Некаторыя прафесіі рабочых (грузчыкі, вадзіцелі, ліфцёры і інш.) у тарыфна-кваліфікацыйны даведнік не ўнесены і ім устаноўлены месячныя аклады. У катэгорыі служачых вылучаны наст. групы: тэхн. выканаўцы (з 5-га па 10-ы разрад), спецыялісты ўсіх галін эканомікі (з 10-га па 15-ы разрад), кіраўнікі падраздзяленняў (з 14-га па 23-і разрад), кіраўнікі прадпрыемстваў і ўстаноў (з 16-га па 23-і разрад) і інш. У бюджэтнай сферы з 8-га па 21-ы разрад размеркаваны работнікі культуры, уключаючы кіраўнікоў, з 13-га па 17-ы — урачы, з 17-га па 23-і — кіраўнікі мед. устаноў, з 16-га па 21-ы — навук. супрацоўнікі, з 22-га па 27-ы — кіраўнікі ВНУ. У залежнасці ад умоў працы, меры адказнасці і інш. да тарыфных ставак рабочых адпаведных разрадаў ужываецца каэф. павышэння ставак (напр., у рабочых, якія працуюць у шахтах, на буд-ве метрапалітэна ён складае 1,9).

ТАРЫ́ФНАЯ СІСТЭ́МА, сукупнасць нарматываў, з дапамогай якіх дыферэнцыруецца *заработная плата* рабочых і служачых у залежнасці ад умоў працы, яе складанасці і ролі галіны ў нар. гаспадарцы. Дае магчымасць улічваць шкоднасць работ і адказнасць за іх выкананне, розніцу паміж працай кваліфікаванай і некваліфікаванай, цяжкай і лёгкай, стымуляваць да павышэння кваліфікацыі і прадукцыйнасці працы. Складаецца з *тарыфных ставак* і надбавак да іх, *тарыфных сетак*, схем службовых акладаў, *тарыфна-кваліфікацыйнага даведніка*.

ТАРЫ́ФНАЯ СТА́ЎКА, памер аплаты працы работніка за адзінку часу (гадзіна, дзень, месяц). Зыходны ўзровень Т.с. работнікаў рознай кваліфікацыі складае стаўка 1-га разраду. Стаўкі вышэйшых *тарыфных разрадаў* вылічваюцца множаннем стаўкі 1-га разраду на адпаведны каэфіцыент пэўнага разраду *тарыфнай сеткі*.

ТАРЫ́ФНЫ КАЭФІЦЫ́ЕНТ, адносіны тарыфнай стаўкі 2-га і наступных разрадаў *тарыфнай сеткі* да стаўкі 1-га разраду, якая прымаецца за адзінку. Сярэдні Т.к. работ або работнікаў характарызуе ўзровень складанасці работ і кваліфікацыі работнікаў, якія аплачваюцца паводле пэўнай тарыфнай сеткі.

ТАРЫ́ФНЫ РАЗРА́Д, адзін з асн. элементаў *тарыфнай сеткі*. Характарызуе ўзровень кваліфікацыі работніка і залежыць ад складанасці і дакладнасці выконваемых ім работ. Патрабаванні для прысваення Т.р. вызначаны ў *тарыфна-кваліфікацыйным даведніку* (для рабочых) і кваліфікацыйным даведніку пасад служачых.

ТАРЫ́ФЫ (ад франц. tarif), сістэма ставак, па якіх спаганяецца плата за паслугі. Найб. пашыраны *мытныя тарыфы*, Т. транспартныя, сувязі, страхавыя, камунальныя.

Т. т р а н с п а р т н ы я — стаўкі, па якіх аплачваюцца перавозкі грузаў, пасажыраў, багажу і пошты, а таксама пагрузачна-разгрузачныя работы, паслугі партоў, аэрапортаў і інш. Адрозніваюць Т. чыгуначнага, аўтамабільнага, марскога, рачнога, паветранага, трубаправоднага транспарту. Асн. фактары, якія ўлічваюцца пры фарміраванні і дыферэнцыяцыі трансп. Т.: адлегласць і від перавозкі (гарадская, міжгародняя, унутр., міжнар., кабатажная і інш.); від і памер грузу (дробны, павагонны, кантэйнерны і інш.); геагр. раён перавозкі. На ўсіх відах транспарту прадугледжваецца шырокі набор спец., ільготных,



Ю.В.**Тарыч**.

дамоўленых Т., якія накіраваны на актывізацыю попыту і дзейнічаюць у залежнасці ад рыначнай кан'юнктуры і стану трансп. галіны. Т. с у в я з і — цэны за паслугі, якія прадпрыемствы сувязі аказваюць спажыўцам. Асн. фактары дыферэнцыяцыі Т. — адлегласць, працягласць паслуг, час сутак, ступень тэрміновасці і інш. Формы спагнання плацяжу: пагадзінная, арэндная, абанементная платы або іх камбінацыі. Т. с т р а х а в ы я — стаўкі страхавога ўзносу з адзінкі страхавой сумы або аб'екта страхавання. Прызначаецца для выплачвання страхавой кампенсацыі. Велічыня Т. вызначаецца ў дагаворы на страхаванне па дамоўленасці бакоў. Т. к а м у н а л ь н ы я — стаўкі за карыстанне электраэнергіяй, газам, вадой і інш. Дыферэнцыруюцца ў залежнасці ад катэгорый спажыўцоў (насельніцтва, прам-сць і інш.), Т. за карыстанне шэрагам паслуг для насельніцтва ніжэйшыя, чым для ўстаноў.

ТАРЫ́ХАС ЭРЭ́РА (Torrijos Herrera) Амар (13.2.1929, г. Сант'яга, Панама — 1.8.1981), ваенны і дзярж. дзеяч Панамы. Брыгадны ген. (1969). Служыў у Нац. гвардыі Панамы, з 1968 яе камандзір. У кастр. 1968 узначаліў ваен. пераварот і стаў фактычным кіраўніком Панамы. У 1972—79 кіраўнік панамскага ўрада і Вярх. лідэр панамскай рэвалюцыі. Дамогся ў 1977 ад адміністрацыі ЗША падпісання дагавора аб *Панамскім канале*, паводле якога канал паступова пераходзіў пад юрысдыкцыю Панамы. Загінуў у авіяц. катастрофе.

ТА́РЫЧ (сапр. А л я к с е е ў) Юрый Віктаравіч (14.1.1885, г. Полацк Віцебскай вобл. — 22.2.1967), бел. і расійскі кінарэжысёр, сцэнарыст; заснавальнік бел. кіно. Засл. дз. маст. Расіі (1935). Вучыўся ў Маскоўскім ун-це (1903—05). У 1905 за рэв. дзейнасць сасланы ў Табольскую губ. З 1907 акцёр правінцы-

яльных т-раў у Сібіры, з 1918 акцёр і рэжысёр маскоўскіх т-раў (у 1920—24 адзін з кіраўнікоў Курсанцкага т-ра ў Крамлі). З 1923 выступаў як сцэнарыст, з 1925 рэжысёр кіно. Паставіў у Расіі фільмы «Марока» (з Я.Івановым-Барковым), «Першыя агні», «Банда бацькі Кныша» (усе 1925), «Крылы халопа» (1926), «Булат-Батыр» і «Капітанская дачка» (1928). У 1926 зняў першы бел. маст. фільм «Лясная быль» паводле аповесці М.Чарота «Свінапас» — гераіка-рамантычная стужка пра падзеі грамадз. вайны на Беларусі. У 1928—39 на кінастудыі «Савецкая Беларусь», дзе паставіў фільмы: «Да заўтра» (1929), «Нянавісць» і «Вышыня 88,5» (абодва 1930), «Шлях карабля» (1935), «Адзінацатае ліпеня» (1938). Творчасць Т. вызначаецца спалучэннем рэальных гіст. падзей з маст. вымыслам, рамантызму з псіхалагізмам, тонкім адчуваннем бел. прыроды. У час Вял. Айч. вайны зняў навелу «На кліч маці» для кіназборніка «Беларускія навелы» (1942, з У.Коршам-Сабліным). У 1943—45 маст. кіраўнік кінастудыі «Манголкіно», з 1945 на кінастудыях Масквы. У 1951—54 зняў дакумент. фільмы на кінастудыі «Беларусьфільм» («Народны паэт», 1952, і інш.), маст. кіраўнік кінафільма «Апавяданні пра юнацтва» (1961).

Літ.: Красинский А.В. Юрий Тарич. Мн., 1971; Власов М. Юрий Тарич // 20 режиссерских биографий. М., 1971; Гісторыя кінамастацтва Беларусі: У 4 т. Т. 1. 1924—1959 гг. / А.В.Красінскі. Мн., 2001.

В.Ф.Нячай.

ТАРЫЧЭ́ЛІ (Torricelli) Эванджэліста (15.10.1608, г. Фаэнца, Італія — 25.10.1647), італьянскі фізік і матэматык. Атрымаў матэм. адукацыю ў Рыме. З 1642 праф. фізікі і матэматыкі Фларэнційскага ун-та. Навук. працы па механіцы, пнеўматыцы і гідраўліцы. Вызначыў парабалічны характар траекторый руху цел, кінутых пад адвольным вуглом да гарызонту. Сфармуляваў закон выцякання вадкасці з адтуліны пасудзіны і вывеў формулу скорасці выцякання (гл. *Тарычэлі формула*). Адкрыў існаванне атмасфернага ціску і вакууму (Тарычэліева пустата), растлумачыў прычыны ўтварэння ветру. Вынайшаў ртутны барометр і спіртавы тэрмометр. Займаўся канструяваннем мікраскопаў і шліфоўкай лінзаў для тэлескопаў. У яго гонар названа адзінка ціску — *тор*.

Літ: Льоцци М. История физики: Пер. с итал. М., 1970. С. 87—89, 97—102; Голин Г.М., Филонович С.Р. Классики физической науки (с древнейших времен до начала XX в.). М., 1989.

А.І.Болсун.

ТАРЫЧЭ́ЛІ ФО́РМУЛА, выраз, які набліжана вызначае скорасць выцякання вадкасці з адтуліны ў сценцы адкрытай пасудзіны. Мае выгляд: $v = \sqrt{2gh}$, дзе v — модуль скорасці выцякання вадкасці, h — адлегласць ад восі адтуліны да паверхні вадкасці, g — паскарэнне свабоднага падзення. Атрымана Э.*Тарычэлі* (1641).

У рэальных выпадках скорасць выцякання вадкасці залежыць ад формы і памеру адтуліны, вязкасці вадкасці і ад некаторых інш. параметраў. У гідраўліцы карыстаюцца формулай $v = \varphi\sqrt{2gh}$, дзе φ — каэфіцыент скорасці. Для малой круглай адтуліны і вялікіх *Рэйнальдса лікаў* $\varphi = 0{,}94$—$0{,}99$, значэнні φ для інш. выпадкаў вызначаюцца тэарэтычна і прыведзены ў спец. даведніках.



Э.**Тарычэлі**.



Т.**Таса**.

ТАРЭАДО́Р, тарэра (ісп. toreador, torero ад toro бык), удзельнік бою быкоў на арэне. Маюць некалькі спецыялізацый: хуласы (капеадоры) цвеляць быка чырвонымі хусткамі; бандэрыльеры (пешыя байцы *карыды*, якія кідаюць у быка невялікія ўпрыгожаныя стужкамі коп'і — бандэрыльі); *матадоры* (эспада), узброеныя шпагай байцы, якія завяршаюць бой.

ТАРЭ́З (Thorez) Марыс (28.4.1900, г. Нуаель-Гадо, Францыя — 11.7.1964), французскі паліт. і дзярж. дзеяч. Да 1920 працаваў парабкам, шахцёрам. Камуніст з 1920. Чл. ЦК (з 1924), Палітбюро ЦК (з 1925), ген. сакратар (1930—64), старшыня (1964) Франц. камуніст. партыі. Чл. Выканкома (1928—43) і Прэзідыума Выканкома (1935—43) *Камуністычнага Інтэрнацыянала*. З 1932 дэп. франц. парламента. Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў антыфаш. *Народнага фронту* ў Францыі (1935—38). У 1940—44 жыў у СССР, адзін з арганізатараў руху Супраціўлення ў Францыі ў 2-ю сусв. вайну. Пасля вяртання на радзіму чл. Часовай кансультатыўнай асамблеі (1944—45), дэп. Устаноўчага сходу (1945—46), дэп. Нац. сходу (з ліст. 1946). У 1945—47 міністр без партфеля, віцэ-старшыня Савета міністраў Францыі. Працы па пытаннях рабочага і дэмакр. руху.

ТАРЭ́НТ, Тарант (лац. Tarentum, грэч. Taras), старажытнагрэчаская калонія ў Італіі на беразе Тарэнцкага заліва (цяпер г. Таранта). Засн. каля 700 да н.э. *дарыйцамі*. Першапачаткова ў Т. кіравалі цары, у 2-й пал. 6 ст. да н.э. тут усталявалася тыранія, з пач. 5 ст. да н.э. — рабаўладальніцкая дэмакратыя. Росквіту дасягнуў у 1-й пал. 4 ст. да н.э., быў буйным гандл.-рамесным цэнтрам. У вайне з Рымам 282—272 да н.э. пацярпеў паражэнне. У 2-ю Пунічную вайну быў на баку *Ганібала*. У 209 да н.э. зноў падпарадкаваны Рыму. Каля 125 да н.э. на тэр. Т. заснавана рым. калонія Нептунія.

А.Г.Зельскі.

ТАРЭО́Н (Torreón), горад на Пн Мексікі, на Мексіканскім нагор'і, на выш. 2134 м, штат Кааўіла. Засн. ў 1893. Каля 500 тыс. ж. (2001), утварае агламерацыю з гарадамі Гомес-Паласьё і Сьюдад-Лерда. Вузел чыгунак і аўтадарог. Аэрапорт. Звязаны прадукта- і газаправодамі з гарадамі Мантэрэй і Чыўаўа. Прам-сць: каляровая металургія, бавоўнаачышчальная, хім., цэм., харч., с.-г. машынабудаванне. Гандл. цэнтр аднаго з гал. раёнаў арашальнага земляробства ў краіне.

ТА́СА (Tasso) Тарквата (11.3.1544, г. Сарэнта, Італія — 25.4.1595), італьянскі паэт; прадстаўнік позняга Адраджэння. Вучыўся ва ун-тах Падуі і Балонні (1560—65). З 1565 служыў у кардынала Луіджы д'Эстэ, з 1572 прыдворны паэт ферарскага герцага Альфонса II д'Эстэ. Першы адметны твор — фантаст. паэма «Рынальда» (1562). У пастаральнай драме «Амінта» (1573) уславіў каханне. Гал. твор — эпічная паэма ў актавах «Вызвалены Іерусалім» (1580), напісаная ў традыцыях гераічнага эпасу і рыцарскага рамана. Асн. канфлікт твора — сутыкненне рэліг. абавязку і пачуцця. Паэма была асуджана інквізіцыяй, 2-я рэдакцыя пад назвай «Завяваны Іерусалім» (1593) мае артадаксальна-каталіцкі характар. Аўтар паэмы «Сем дзён стварэння свету» (1594), філас. «Дыялогаў» (збярэгліся 28, у т.л. «Бацька сям'і», 1583) і інш. У апошнія гады жыцця пасля цяжкай псіхічнай хваробы адышоў ад ідэй гуманізму, пачаўся заняпад яго творчасці. Вобраз Т. як чалавека і паэта адлюстраваны ў творах І.В.Гётэ, Дж.Байрана, Дж.Леапардзі, К.Бацюшкава, Н.Кукальніка і інш.

Тв.: Рус. пер. — Освобожденный Иерусалим. Т. 1—2. М., 1911; Аминта. М.; Л., 1937.

ТАСКА́НА (Toscana), вобласць у Цэнтр. Італіі, на ПнЗ Апенінскага п-ва. Абмываецца Лігурыйскім і Тырэнскім морамі. Пл. 23 тыс. км^2. Нас. каля 4 млн. чал. (2001). Уключае правінцыі: Масса-Карара, Лука, Пістоя, Фларэнцыя, Ліворна, Піза, Арэца, Сіена, Грасета. Гал. горад і эканам. цэнтр — *Фларэнцыя*. Большую ч. тэр. займаюць *Апеніны*; узбярэжжа нізіннае. Клімат міжземнаморскі. Каля 40% тэр. (пераважна ў гарах) пад лесам. Развітая эканам. вобласць. Здабыча кінавары, жал. руды, бурага вугалю, пірытаў, мармуру. Прам-сць: чорная металургія, маш.-буд., хім., нафтаперапр., тэкст., папяровая. Пасевы пшаніцы і інш. збожжавых, цукр. буракоў, тытуню, агародніны. Каля 20% с.-г. угоддзяў пад садамі, вінаграднікамі, насаджэннямі аліў. Свіна- і авечкагадоўля. Турызм.

У пач. 3 ст. да н.э. (наз. Тусцыя, Этрурыя) завявана рымлянамі, у канцы 5 ст. н.э. — остготамі, у 6 ст. — Візантыяй, потым лангабардамі. З канца 8 ст. ўваходзіла ва ўладанні Карла Вялікага (з 9 ст. маркграфства), з канца 10 ст. — у «Свяшчэнную Рым. імперыю». У 11—12 ст. на тэр. Т. ўтварыліся камуны

Фларэнцыя, Лука, Сіена, Піза, Арэца і Пістоя з развітым рамесніцтвам і гандлем. У 1-й пал. 15 ст. Т. кіравала дынастыя фларэнційскіх Медычы, з 1737 — Латарынгская дынастыя. У час напалеонаўскіх войнаў акупіравана (1800) франц. войскамі, у 1801 на яе тэр. ўтворана каралеўства Этрурыя, якое ў 1807—08 далучана да Францыі. Венскі кангрэс 1814—15 аднавіў Вял. герцагства Тасканскае. У час *Рысарджымента* тэр. Т. ў 1860 далучана да Сардзінскага (з 1861 Італьянскага) каралеўства. У 2-ю сусв. вайну акупіравана (1943) ням.-фаш. войскамі, вызвалена ў 1944 сіламі руху Супраціўлення.

ТАСКАНІ́НІ (Toscanini) Артура (25.3.1867, г. Парма, Італія — 16.1.1957), італьянскі дырыжор; адзін з буйн. дырыжораў 20 ст. Скончыў кансерваторыю ў Парме (1885). З 1887 оперны і сімф. дырыжор у Італіі. У 1898—1903, 1906—08 і 1921—29 узначальваў т-р «Ла Скала» ў Мілане, у 1908—15 дырыжыраваў у «Метраполітэн-опера» ў Нью-Йорку, з 1928 узначальваў аркестры Нью-Йоркскай філармоніі, Нац. радыёвяшчальнай кампаніі. Яго выканаўчае мастацтва вылучалі тэмперамент, дакладнасць раскрыцця аўтарскай задумы. Рэпертуар уключаў творы розных стыляў і эпох. Паўплываў на развіццё сучаснага дырыжорскага мастацтва. Упершыню пад кіраўніцтвам Т. выкананы ў Італіі 6-я сімф. П.Чайкоўскага (1898), у ЗША — 7-я сімф. Дз.Шастаковіча (1942) і пастаўлена опера «Барыс Гадуноў» М.Мусаргскага (1913).

Літ.: Искусство А.Тосканини: Воспоминания, биогр. материалы. Л., 1974; Вальденго Д. Я пел с Тосканини: Пер. с итал. 2 изд. Л., 1989. *Э.А.Алейнікава.*

ТАСКА́НСКІ О́РДЭР, адзін з архітэктурных *ордэраў*; разнавіднасць *дарычнага ордэра*, ад якога адрозніваецца адсутнасцю *канелюраў*, большай таўшчынёй калон і гладкім *фрызам*. Назва ад вобласці Таскана ў Цэнтр. Італіі (стараж. Этрурыя). Нясучыя часткі — гладкі ствол калоны з *капітэллю* і базай. Капітэль складаецца з шыйкі, якая злучае яе са ствалом калоны, *эхіна* і *абака*; антаблемент — з архітрава, гладкага фрыза і карніза. Як маст.-выразная форма Т.о. склаўся ў архітэктуры Стараж. Рыма. На Беларусі выкарыстоўваўся ў архітэктуры класіцызму (*Мінская кірха*, сядзібны дом у в. Нача Ляхавіцкага р-на Брэсцкай вобл. і інш.). *В.Ф.Валошын.*

ТА́СМАН (Tasman) Абел Янсзан (1603, Лутгегаст, Нідэрланды — кастр. 1659), галандскі мараплавец, даследчык Аўстраліі і Акіяніі. У 1638—41 прымаў удзел у экспедыцыях, якія даследавалі моры Усх. Азіі, адкрылі а-вы Банін (1639). У 1642—43 кіраваў 1-й экспедыцыяй у Індыйскі і Ціхі акіяны, адкрыў паўд. і ўсх. берагі вострава, які пазней названы яго імем — Тасманія, дасягнуў зах. берага Новай Зеландыі, адкрыў а-вы Тры-Кінгс і Тонга, зах. ч. а-воў Фіджы. У 1644 у час 2-й экспедыцыі адкрыў паўд. і зах. берагі зал. Карпентарыя, даследаваў паўн. і паўн.-зах. ўзбярэжжа Аўстраліі. У выніку 2 экспедыцый даказана, што Аўстралія — адзіны масіў сушы, не звязаны з гіпатэтычным Паўд. мацерыком. Яго імем названы мора паміж Аўстраліяй і Новай Зеландыяй, паўн.-зах. выступ Аўстраліі, катлавіна ў паўд.-зах. ч. Ціхага ак. і інш.

ТА́СМАНА ЗЯМЛЯ́ (Tasman Peninsula), паўночна-заходні выступ мацерыка Аўстралія, паміж залівамі Кінг і Кембрыдж. Уключае пласкагор'е Кімберлі, вулканічнае плато Антрым, нізіну р. Фіцрой і моцна парэзанае ўзбярэжжа Індыйскага акіяна. Эўкаліптавыя рэдкалессі, хмызняковыя зараснікі, участкі саваннай расліннасці. Нац. парк Гейкі-Горадж. Названа імем *А.Я.Тасмана.*



Тасканскі ордэр.

ТАСМА́НАВА КАТЛАВІ́НА, падводная катлавіна ў паўд.-зах. частцы Ціхага ак., паміж мацерыковымі схіламі Аўстраліі і Новай Зеландыі і падводным хр. Лорд-Хау. Даўж. больш за 2400 км, шыр. каля 1500 км, пераважная глыб. 4500 м, найб. 6015 м. Названа імем *А.Я.Тасмана.*

ТАСМА́НАВА МО́РА (Tasman Sea), ускраіннае мора Ціхага ак. паміж Аўстраліяй і в-вам Тасманія на З, а-вамі Новая Зеландыя, Норфалк і Новая Каледонія на У. На Пн аддзелена ад Каралавага м. падняццем дна і каралавымі а-вамі і рыфамі. Пралівам Баса на ПдЗ злучана з Індыйскім ак. Пл. 3336 тыс. км^2. Найб. глыб. 6015 м. У сярэдняй ч. перасякаецца падводным хрыбтом. Т-ра паверхневых вод у лют. ад 27 °С на Пн да 15 °С на Пд, у жн. ад 23 °С на Пн да 9—11 °С на Пд. Салёнасць 35—35,5 ‰. Прылівы паўсутачныя (да 5,3 м). Рыбалоўства. Гал. парты: Сідней, Брысбен, Ньюкасл (Аўстралія), Окленд, Ньюплімут (Новая Зеландыя). Названа імем *А.Я.Тасмана.*

ТАСМАНІ́ЙСКІ ВОЎК, гл. *Сумчаты воўк.*

ТАСМА́НІЯ (Tasmania), востраў каля паўд.-ўсх. ўзбярэжжа Аўстраліі. Аддзелены ад мацерыка прал. Баса. Пл. каля 65 тыс. км^2. У рэльефе пераважаюць плато і нагор'і выш. 600—1000 м. Вылучаюцца Усх. нагор'е (выш. да 1572 м) і Цэнтр. плато (выш. да 1617 м). Карысныя выкапні: поліметал. і жал. руды, волава, медзь, золата і інш. Клімат на Пн субтрапічны, на Пд умераны. У г. Хобарт сярэдняя т-ра ліп. 8 °С, студз. 17 °С. Ападкаў ад 600 мм (на У) да 2800 мм (на З у гарах). Шмат паўнаводных горных рэк. На З і ПдЗ — вільготныя горныя лясы з эўкаліптаў і хвойных, дрэвападобных папарацей у спалучэнні з альпійскай расліннасцю, у астатніх раёнах пераважаюць эўкаліптавыя лясы, месцамі лугі і балоты. У жывёльным свеце пераважаюць сумчатыя, сярод іх ёсць і драпежнікі (тасманійскі д'ябал). Востраў адкрыты А.Я.*Тасманам* у 1642, названы ў яго гонар у 1853. Аб насельніцтве і гаспадарцы гл. ў арт. штат *Тасманія.*



Краявід на Пд Тасманіі.

ТАСМА́НІЯ (Tasmania), штат Аўстраліі. Займае в-аў *Тасманію* і прылеглыя а-вы. Пл. 68,3 тыс. км². Нас. 473,5 тыс. чал. (1997), пераважна англа-аўстралійцы, невял. колькасць выхадцаў з Вялікабрытаніі і інш. еўрап. краін. Абарыгены-тасманійцы не захаваліся, ёсць невял. група метысаў. Адм. і прамысл. ц., галоўны порт — г. *Хобарт*. Гал. галіна гаспадаркі — прамысловасць. Здабыча медных, жал., цынкавых, свінцовых, алавяных руд, золата, серабра, каменнага вугалю. На базе багатых гідрарэсурсаў развіты энергаёмістыя галіны (атрыманне электралітнай медзі, цынку, свінцу, кадмію, кобальту, аксіду тытану, алюмінію, ферамарганцу). Прадпрыемствы цэлюлозна-папяровай, тэкст., харч., цэм., дрэваапр. прам-сці. Лесанарыхтоўкі. Гал. галіна сельскай гаспадаркі — жывёлагадоўля (каля 4 млн. авечак, 1 млн. галоў буйн. раг. жывёлы). У земляробстве пераважае вырошчванне кармавых культур, агародніны. Садоўніцтва. Транспарт чыг., аўтамаб., марскі.

ТА́ТАБАНЬЯ (Tatabánya), горад на ПнЗ Венгрыі. Адм. ц. медзьё Комарам. Каля 100 тыс. ж. (2001). Вузел чыгунак і аўтадарог. Цэнтр буравугальнага басейна. Прам-сць: каляровая металургія (выплаўка алюмінію), хім., цэм., тэкст., вытв-сць сродкаў сувязі. Музей гісторыі прам-сці.

ТАТАЛІЗА́ТАР (франц. totalisateur ад totaliser падсумоўваць), механічны лічыльнік на іпадроме, які паказвае на скачках суму грашовых ставак на пэўнага каня. Т. наз. таксама бюро, якое прымае стаўкі і выплачвае выйгрыш, і сама гульня на грошы на скачках.

ТАТАЛІТАРЫ́ЗМ (франц. totalitarisme ад лац. totus увесь, цэлы), 1) сацыяльна-паліт. сістэма, у якой ажыццяўляецца поўнае падпарадкаванне грамадства, яго паліт., эканам., сац. і духоўнага жыцця ўладзе пануючай эліты. Асн. рысы Т.: манапалізацыя ўлады пэўнай паліт. партыяй і абсалютная ўлада яе правадыра; усеахопны паліт. кантроль дзяржавы над усімі сферамі грамадскага жыцця; апора паліт. рэжыму на дэкласаваныя, люмпенізаваныя пласты і групы насельніцтва; буйнамаштабнае выкарыстанне метадаў *насілля* і *тэрору* як сродкаў захавання і ўмацавання таталітарнага рэжыму; мілітарызацыя эканомікі і ўсіх сфер грамадскага жыцця; адхіленне большасці насельніцтва ад удзелу ў фарміраванні і дзейнасці дзярж. і паліт. органаў; забарона дзейнасці дэмакратычна арыентаваных арг-цый і падаўленне апазіцыі; панаванне агульнай для ўсіх ідэалогіі, якая, як правіла, мае утапічны характар і абгрунтоўвае неабходнасць таталітарнага рэжыму, які нібыта служыць сродкам перабудовы грамадства з мэтамі дасягнення «новага парадку», «усеагульнага дабра», «светлай будучыні» і да т.п. 2) Канцэпцыя, якая абгрунтоўвае сутнасць таталітарнай дзяржавы і адпаведнага паліт. рэжыму. Вытокі канцэпцыі Т. ў вучэнні пра татальнасць (гл. *Цэласнасць*), якое распрацоўвала ням. філасофія 19 ст. Паліт. накіраванасць тэрміну «Т.» надалі ў 1920-я г. крытыкі фашысцкага рэжыму ў Італіі Дж.Амендала і П.Габеці. Тэарэтыкі *фашызму* Дж.Джэнтыле і А.Роска (Італія), Э.Юнгер і К.Шміт (Германія) і інш. выкарыстоўвалі канцэпцыю Т. для абгрунтавання неабходнасці фаш. таталітарнага рэжыму, ідэй «татальнай дыктатуры», «татальнай дзяржавы», «татальнай волі да ўлады», *«татальнай мабілізацыі»*. У 1930—40-я г. прадстаўнікі франкфурцкай школы распрацоўвалі аналітыка-крытычную трактоўку Т. як сац. механізму захавання ўлады ў руках правадыра, татальнага панавання ваенна-паліт. рэжыму, падаўлення апазіцыі, масавага тэрору і поўнай бяспраўнасці чалавека (Т.Адорна, Г.Маркузе, Э.Фром і інш.). У 1950—80-я г. аналітычная канцэпцыя Т. выкарыстоўвалася для крытыкі камуніст. сац.-паліт. сістэмы (Г.Арэнт, З.Бжазінскі, М.Джылас і інш.). Гл. таксама *Аўтарытарызм, Культ асобы*.

Літ.: Арон Р. Демократия и тоталитаризм: Пер. с фр. М., 1993; Арендт Х. Истоки тоталитаризма: Пер. с англ. М., 1996; Тоталитаризм в Европе XX в.: Из истории идеологий, движений, режимов и их преодоления. М., 1996; Иванов Ю.М. Очерки теории и практики тоталитарного социализма. М., 1997; Соловьев Э.Г. Феномен тоталитаризма в политической мысли России и Запада. М., 1997. *Я.М.Бабосаў.*

ТАТА́ЛЬНАЕ МАСТА́ЦТВА, тэрмін авангардысцкай эстэтыкі 1960-х г., які абазначае імкненне да ўсеабдымнасці мастацтва, да знішчэння межаў не толькі паміж асобнымі відамі маст. творчасці, але і паміж мастацтвам і рэчаіснасцю. Тагачасныя авангардысцкія кірункі імкнуліся да «растварэння» мастацтва ў асяроддзі, да зліцця яго з працэсамі жыцця, што найб. яскрава выявілася ў такіх формах, як *хэпенінг, перформанс*, мульты-медыя, *інвайрэнмент, лэнд-арт*. Гранічным выяўленнем прынцыпаў Т.м. з'яўляецца сцвярджэнне, што любы фрагмент рэальнасці і ўвесь свет — творы мастацтва. *С.У.Пешын.*

ТАТА́ЛЬНАСЦЬ (ад позналац. totalis увесь, цэлы), абагульненая характарыстыка аб'ектаў, якія вылучаюцца складанай унутранай структурай, інтэграванасцю, самадастатковасцю, аўтаномнасцю і проціпастаўленасцю асяроддзю; тое, што *цэласнасць*.

«ТАТА́ЛЬНАЯ ВАЙНА́», *вайна*, якая вядзецца з выкарыстаннем усіх матэрыяльных сродкаў і інш. магчымасцей дзяржавы, а таксама любых спосабаў масавага знішчэння ўзбр. сіл і насельніцтва праціўніка.

Тэорыя «Т.в.» распрацавана напярэдадні *другой сусветнай вайны 1939—45* ням. ген. *Э.Людэндорфам*, у сістэматызаваным выглядзе выкладзена ў яго кнізе «Татальная вайна» (1936). Узбр. проціборства, якое планавалася Гітлерам як *«маланкавая вайна»*, у 1942—43 набыло рысы татальнасці (у вайну былі ўцягнуты краіны з 80% насельніцтва Зямлі, ва ўзбр. сілы мабілізавана больш за 110 млн. чал.). Ваен.-эканам. і інш. патрэбы дзяржаў-удзельніц, у першую чаргу Германіі і СССР, абумовілі правядзенне *татальнай мабілізацыі* матэр. і людскіх рэсурсаў. Эканоміка СССР і яго саюзнікаў аказалася больш эфектыўнай, што стала перадумовай перамогі ў «Т.в.», якую была вымушана весці Германія пасля катастрофы пад Сталінградам (гл. *Сталінградская бітва 1942—43*) і паражэнняў у інш. бітвах 2-й сусв. вайны.

Некат. элементы «Т.в.» выкарыстаны ЗША, Вялікабрытаніяй у ваен. дзеяннях супраць Германіі і Японіі (атамная бамбардзіроўка Хірасімы і Нагасакі, масіраваныя бамбардзіроўкі гарадоў Германіі), у В'етнаме (1964—73) і інш. *Р.Ч.Лянькевіч.*

ТАТА́ЛЬНАЯ МАБІЛІЗА́ЦЫЯ, сістэма надзвычайных мерапрыемстваў дзяржавы па пераключэнні ўсіх яе матэрыяльных і людскіх рэсурсаў на патрэбы *«татальнай вайны»*.

Напр., Т.м. 1943—45 у Германіі (абвешчана Гітлерам пасля паражэння ням.-фаш. войск пад Сталінградам) павялічыла колькасць узбр. сіл (1943) да 10 млн. чал. (усяго за 1939—45 у вермахт мабілізавана каля 18 млн. чал.). У інш. дзяржавах фаш. блока, напр. у Японіі (у 1945 узбр. сілы дасягнулі 7,2 млн. чал.), замест Т.м. на сваёй тэр. праводзілася мабілізацыя, у т.л. ва ўзбр. сілы, грамадзян інш. акупіраваных краін (Кітай, Карэя). У саюзных дзяржавах антыгітлераўскага блока Т.м. не праводзілася (за выключэннем некат. тэр. СССР). Сучаснымі ваен. дактрынамі большасці краін Т.м. не прадугледжваецца. *Р.Ч.Лянькевіч.*

ТАТА́РКА, рабочы пасёлак у Асіповіцкім р-не Магілёўскай вобл. Чыг. ст. на лініі Асіповічы—Жлобін. За 12 км на ПдУ ад Асіповіч, 148 км ад Магілёва. 1 тыс. ж. (2001). Працуюць торфапрадпрыемствы, сярэдняя і муз. школы, дзіцячы сад-яслі, клуб, паліклініка, амбулаторыя, Дом быту, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.



Татарнік калючы.

У 2-й пал. 19 ст. вёска (35 ж.) у Ляскавіцкай вол. Бабруйскага пав. З пабудовай Лібава-Роменскай чыгункі (1873) — станцыя, дзе адгружалася за год больш як 50 тыс. пудоў лесаматэрыялаў. З 1924 у Асіповіцкім р-не Бабруйскай акругі, з 1938 у Магілёўскай вобл. Значна выросла з буд-вам торфазавода (у 1940 працавала 414 рабочых). У 1944—54 у Бабруйскай вобл. З 14.5.1949 рабочы пасёлак.

ТАТА́РНІК (Onopordum), род кветкавых раслін сям. складанакветных. Каля 40 відаў. Пашыраны ў Еўропе, Зах. Азіі і Паўн. Афрыцы. На Беларусі 1 від — Т. калючы (O. acanthium), нар. назвы чартапалох, чортавы пазуры. Трапляецца ўздоўж дарог, каля жылля, на пустках.

Двух- і шматгадовыя травяністыя расліны выш. 150—170 см. Сцёблы прамастойныя, голыя або павуціністыя, з шырокімі калючымі крыламі. Лісце буйное, перыста-лопасцевае ці зубчастае, з калючкамі. Кветкі ружовыя, радзей белыя або жоўтыя, сабраныя ў буйныя адзіночныя кошыкі. Плод — сямянка. Меданосныя, лек., дэкар. расліны, часам пустазелле. *А.М.Скуратовіч.*

ТАТА́РСКАЕ МЫ́ЛА, кветкавая расліна, гл. ў арт. *Зорка*.

ТАТА́РСКАЯ МО́ВА, адна з *цюркскіх моў* (кыпчацка-булгарская група); мова *татар*, афіц. мова *Татарстана*. Пашырана ў Башкортастане, Чувашыі, Удмурціі, Мардовіі, у многіх абласцях Расіі, асобных раёнах Узбекістана, Казахстана, Азербайджана, Таджыкістана, Туркменістана. Мае 3 групы дыялектаў: цэнтр. ў Паволжы (вакол Казані), зах. на еўрап. частцы Расіі (вакол Варонежа, Саратава, Разані і інш.), усх. ў Сібіры (вакол Томска, Цюмені, Табольска і інш.). Татарскія дыялекты значна адрозніваюцца фанет. і марфал. рысамі. Т.м. ўласцівы: у фанетыцы — 10 галосных фанем, наяўнасць галосных няпоўнага ўтварэння, адсутнасць губна-зубной фанемы «в», адсутнасць афрыката «ч»; у марфалогіі — аналітызм часавых форм дзеяслова; у сінтаксісе — багацце тыпаў даданых сказаў; у лексіцы — запазычанні з араб., перс., рус. моў. Сучасная літ. Т.м. па фанетыцы і лексіцы блізкая да цэнтр. дыялекта, а па марфал. структуры — да заходняга. Пісьменнасць (помнікі з 13 ст.) да 1928 на аснове араб., потым лац., з 1939 на аснове рус. алфавіта.

Літ.: Закиев М.З. Татарский язык // Языки народов СССР. М., 1966. Т. 2.

А.Я.Міхневіч.

ТАТА́РСКІ ПРАЛІ́Ў. Паміж мацерыком Азія і в-вам *Сахалін*. Злучае Японскае і Ахоцкае моры (праз Невяльскога праліў, Амурскі ліман і Сахалінскі зал.). Даўж. 663 км, шыр. на Пд да 324 км, на Пн да 40 км, у самым вузкім месцы (Невяльскога праліў) 7,3 км, найменшая глыб. на фарватэры 8 м. Зімой замярзае. Прылівы на Пд паўсутачныя і мяшаныя (да 2,7 м), у Амурскім лімане няправільныя, сутачныя (больш за 2 м). Рыбалоўства. Гал. парты: Ваніна, Аляксандраўск-Сахалінскі, Невельск, Холмск (Расія).

ТАТА́РСКІЯ НАБЕ́ГІ НА БЕЛАРУ́СЬ у канцы 15 — 1-й палавіне 16 ст. Адным з найважнейшых шляхоў узбагачэння феадалаў *Крымскага ханства* былі грабежніцкія паходы на землі суседніх дзяржаў (ВКЛ, Рускай дзяржавы, Польскага каралеўства і інш.). Татары спусташалі і палілі вёскі і гарады, забівалі мірных жыхароў, рабавалі іх маёмасць, вывозілі на продаж у рабства палонных. Значныя татарскія набегі на бел. землі адбыліся ў 1497 (на Мазыршчыну), 1500 (Брэст, Камянец), 1501 (Палессе), 1502 (Тураўшчына), у жн. 1503 (Капыль, Клецк, Нясвіж, Слуцк), восенню 1503 (дайшлі да Новагародка, разгромлены каля Давыд-Гарадка), у 1505 (Мінск, Слуцк, Новагародак; асобныя татарскія атрады даходзілі да Вільні, Віцебска, Друцка, Лагойска і Полацка; вывелі каля 100 тыс. палонных). У 1506 20-тысячная татарская арда ўварвалася на Беларусь і спынілася каля Клецка, дзе была разгромлена войскам ВКЛ (гл. *Клецкая бітва 1506*). У 1510 15-тысячная арда дайшла да Вільні. У 1521 5 тыс. татар дайшлі да Слуцка і Пінска, спалілі Мазыр і Тураў. У 1526 (1527?) 20-тысячная арда спустошыла наваколлі Турава, Пінска і Слуцка, каля Слуцка разгромлена гетманам К.І.*Астрожскім*. Таксама дабіўся перамогі над татарамі ў *Альшаніцкай бітве 1527* на Украіне. У 1530 набег татар на Беларусь быў адбіты. У наступныя гады ў сувязі са значнымі пераменамі знешнепаліт. курсу Крымскага ханства татары нападалі на ВКЛ рэдка і не дасягалі тэр. Беларусі. З 1474 па 1569 адбыліся 75 нападаў крымскіх татар на ВКЛ, у т.л. 12 — на Беларусь. Дадатковым цяжарам на насельніцтва Беларусі клаліся разнастайныя павінасці, якія вынікалі з мер урада ВКЛ па арганізацыі абароны. Амаль штогод з сялян збіралі ардыншчыну для выплаты крымскаму хану даніны. Сяляне і мяшчане рамантавалі і будавалі замкі, неслі дазорную службу. Татарскія напады былі адным з асн. фактараў, што тармазілі працэс сац.-эканам. развіцця Беларусі, асабліва яе паўд.-зах. часткі, у канцы 15 — 1-й трэці 16 ст. *М.Ф.Спірыдонаў.*



ТАТАРСТА́Н, Рэспубліка Татарстан, Татарыя. Размешчана на У еўрап. ч. Рас. Федэрацыі. Пл. 67,8 тыс. км². Нас. 3782 тыс. чал. (2000), гарадскога 74%. Сярэдняя шчыльн. 56 чал. на 1 км². Жывуць татары (48,5%), рускія (43,3%), чувашы (3,7%), мардва, марыйцы, удмурты, башкіры, беларусы (0,2%) і інш. Сталіца — г. *Казань*.



Да арт. **Татарстан**. Куйбышаўскае вадасховішча.

Найб. гарады: Набярэжныя Чаўны, Ніжнякамск, Альмецьеўск, Зеленадольск, Бугульма, Ленінагорск, Чыстапаль, Елабуга, Заінск, Азнакаева.

Прырода. Рака Волга падзяляе Т. на правабярэжжа і левабярэжжа. Большая ч. тэр. на левабярэжжы (Заволжа) — слабахвалістая раўніна (выш. 120—150 м). На ПдУ Бугульмінска-Белебееўскае ўзв. (выш. да 364 м). Правабярэжжа занята паўн. адгалінаваннямі Прыволжскага ўзв. (выш. да 266 м). Карысныя выкапні: нафта і прыродны газ (частка *Волга-Уральскага нафтагазаноснага басейна*), торф, буры вугаль, гаручыя сланцы, прыродныя бітумы, буд. матэрыялы (вапнякі, даламіты, гіпс, гліны і інш.), фасфарыты. Крыніцы мінер. вод, лекавыя гразі. Клімат умерана кантынентальны. Сярэднія т-ры студз. ад -13 °С на З да -14,8 °С на У, ліп. ад 18,7 °С на Пн да 19,6 °С на Пд. Ападкаў на правабярэжжы больш за 500 мм, на левабярэжжы 360—400 мм за год. Гал. рэкі: Волга, Кама, Белая, Вятка. Куйбышаўскае і Ніжнякамскае вадасховішчы. Глебы чарназёмныя (32%), дзярновападзолістыя і шэрыя лясныя, па далінах рэк алювіяльныя. Лясы пераважна ліставыя (дуб, ліпа, клён), займаюць каля 19% тэр. У складзе жывёльнага свету воўк, ліс, лось, вавёрка, бурундук, зайцы і інш.; з птушак глушэц, рабчык, драфа і інш. У вадаёмах 52 віды рыб. Нац. парк Ніжняя Кама, Волжска-Камскі запаведнік.

Гісторыя. Чалавек на тэр. Т. вядомы з палеаліту. Да 8—7 ст. да н.э. ў Волга-Кам'і склалася ананьінская, у пачатку н.э. ў Ніжнім Прыкам'і — п'янаборская культуры. У час Вял. перасялення народаў у Сярэдняе Паволжа праніклі цюрка-угорскія плямёны. У 6—8 ст. павялічылася колькасць цюркамоўнага насельніцтва, культура якога звязана з *Цюркскім каганатам, Хазарскім каганатам* і Вял. Балгарыяй. У 9—10 ст. цюркамоўныя балгары стварылі ў Сярэднім Паволжы дзяржаву *Балгарыя Волжска-Камская*, якая ў 922 прыняла іслам. У 1236—37 яна заваявана войскамі *Батыя* і ўключана ў склад *Залатой Арды*. У час яе існавання адбыліся асн. працэсы кансалідацыі цюрк. народаў у адзіную супольнасць. У 1-й пал. 15 ст. на тэр. Т. ўтварылася *Казанскае ханства*, у якім склалася народнасць паволжска-прыуральскіх *татар*. Працяглая барацьба паміж Рус. дзяржавай і Казанскім ханствам скончылася падзеннем апошняга ў 1552 і далучэннем яго зямель да Расіі. Пачалося інтэнсіўнае пранікненне рускіх на тэр. краю, рабіліся захады па яго прымусовай хрысціянізацыі, для чаго ў 1555 створана Казанская епархія. Карэннае насельніцтва ператворана ў ясачных людзей. Захоп зямель, рост павіннасцей, канфесіянальны прыгнёт сталі прычынай нар. паўстанняў (Еналееўскае паўстанне 1605—16, удзел татар у *Сялянскай вайне 1670—71* і *Сялянскай вайне 1773—75*). Гэта прымусіла царскі ўрад пайсці на некат. ўступкі: у 1773 абвешчана аб рэліг. цярпімасці, у 1784 тат. мурзы ўраўнаваныя ў правах з рус. дваранамі. У 1708 створана Казанская губ., якая ўключала ўсё Сярэдняе Паволжа і Зах. Прыуралле. У 1-й пал. 19 ст. тут склаўся шэраг прамысл. прадпрыемстваў, фарміравалася тат. купецтва і клас прадпрымальнікаў. У канцы 19 ст. склалася тат. нацыя, узмацніліся пазіцыі нац. буржуазіі. Рэвалюцыя 1905—07 дала магутны штуршок развіццю нац. культуры і самасвядомасці тат. народа, руху за нац. роўнасць і дэмакр. свабоды. З'явіўся тат. перыяд. друк. Створана першая агульнамусульм. паліт. партыя «Іттыфак аль-муслімін». Тат. нац-вызв. рух актывізаваўся ў ходзе Лют. і Кастр. рэвалюцый 1917. Створаны нац. парламент — Мілет мэджлісі і органы нац. самакіравання.

27.5.1920 СНК РСФСР прыняў дэкрэт аб утварэнні Татарскай АССР. За гады сав. улады Т. ператварыўся ў край з развітымі сельскай гаспадаркай, шматгаліновай прамысловасцю, сучаснымі навукай і культурай. Татары і інш. народы краю зрабілі буйны крок у развіцці сваіх нац. культур. Разам з тым з 1930-х г. назіраліся захады кіраўніцтва СССР да абмежавання нац. развіцця нярус. народаў, выцяснення іх моў з афіц. ўжытку. У Вял. Айч. вайну больш за 170 ураджэнцаў Т. сталі Героямі Сав. Саюза (у т.л. адзін з абаронцаў Брэсцкай крэпасці П.Гаўрылаў). Нямала воінаў з Т. ўдзельнічала ў партыз. руху на Беларусі (у т.л. З.Нуры, Т.Муратаў). У Т. працавалі эвакуіраваныя з Беларусі прадпрыемствы (абутковая ф-ка, кандытарскі камбінат «Спартак» і воскавашчынны з-д з Гомеля, цагельны з-д з Віцебска). У ліст. 1942 — чэрв. 1943 у Т. жыў Я.Купала. З сярэдзіны 1980-х г. пачаўся новы ўздым нац. самасвядомасці тат. народа. 30.8.1990 Вярх. Савет Тат. АССР змяніў статус рэспублікі і прыняў дэкларацыю аб яе дзярж. суверэнітэце. 12.6.1991 выбраны 1-ы прэзідэнт Рэспублікі Татарстан М.*Шайміеў* (у 1996 і 2001 пераабраны). 21.3.1992 рэсп. рэферэндум вызначыў дзярж. статус Т., у ліст. 1992 прынята яго канстытуцыя.

Гаспадарка. Т. — адна з найб. развітых у эканам. адносінах рэспублік Рас. Федэрацыі. У структуры валавога рэгіянальнага прадукту прам-сць і буд-ва складаюць 51,7%, сельская гаспадарка — 3,7%, сфера паслуг — 44,6%. Асн. галіны прам-сці (паводле кошту прамысл. прадукцыі, 1999): паліўная (33,8%), хім. і нафтахім. (22,5%), маш.-



Да арт. **Татарстан**. Панарама г. Казань.



Да арт. **Татарстан**. Ніжнякамскі нафтахімічны камбінат.

буд. і металаапрацоўка (19,6%), электраэнергетыка (7,1%). Здабыча нафты і газавага кандэнсату (26,3 млн. т, 1999, Рамашкінскае, Новаелхоўскае, Першамайскае, Бандзюжскае і інш. радовішчы). Вытв-сць электраэнергіі 22,1 млрд. кВт·гадз пераважна на ДРЭС (Заінская, Урусінская); Ніжнякамская ГЭС. Выраб шын (8,3 млн. шт., 1-е месца ў Расіі) у Ніжнякамску, пластмасы і сінт. смалы (365 тыс. т, 2-е месца), газаправодных поліэтыленавых труб, сінт. каўчуку (190 тыс. т), кінафотаплёнкі і магнітных стужак, мыйных сродкаў, лакафарбавых матэрыялаў, хіміка-фармацэўтычных прэпаратаў у Казані, мінер. угнаенняў у Мендзялееўску. Маш.-буд. і металаапр. прадпрыемствы вырабляюць велікагрузныя (14,8 тыс. шт., Набярэжныя Чаўны) і легкавыя (28,4 тыс. шт., Елабуга) аўтамабілі, самалёты, верталёты, авіяматоры, газавую апаратуру, вакуумную тэхніку, кампрэсары, ЭВМ, радыёпрыёмнікі (Казань), судны, халадзільнікі і маразільнікі (26,9 тыс. шт., Зеленадольск), машыны і абсталяванне для нафтаздабыўной прам-сці, электралямпы, трубы (100 тыс. т., Альмецьеўск), электратэхн. і нафтавае абсталяванне (Бугульма), гадзіннікі, аўтаспецабсталяванне (Чыстапаль). Харч. і харчасмакавая прам-сць дае 9,5% валавой прадукцыі Т. Развіты вытв-сць мяса (52 тыс. т), масла (17,1 тыс. т, 1-е месца ў Расіі), гарэлкі і лікёра-гарэлачных вырабаў (8,7 млн. дэкалітраў, 2-е месца), піва, алею, цукру (160 тыс. т), малочнай прадукцыі, тытуню. Прадпрыемствы лёгкай прам-сці ў Казані (футравы к-т, абутковая і швейная ф-кі), Чыстапалі (абутковая ф-ка), Елабузе, Зеленадольску (швейная ф-ка), Альмецьеўску (панчошна-шкарпэткавая ф-ка) і інш. Лясная, дрэваапр., цэлюлозна-папяровая прам-сць (вытв-сць дзелавой драўніны, піламатэрыялаў, фанеры, мэблі, паперы, кардону). Вытв-сць буд. матэрыялаў. Фарфорафаянсавая прам-сць. Сельская гаспадарка спецыялізуецца на вытв-сці жывёлагадоўчай прадукцыі і збожжа. С.-г. ўгоддзі займаюць 4,1 млн. га, у т.л. ворныя землі 3,6 млн. га, сенажаці і пашы 0,5 млн. га. Гадуюць (тыс. галоў, 2000) буйн. раг. жывёлу (1190), свіней (752), авечак і коз (513). Развіты птушкагадоўля, футравая звярагадоўля, трусагадоўля, спарт. і племянная конегадоўля, пчалярства (1253 т мёду, 2000), рыбаводства. Пасяўныя пл 3 млн. га (1999), пад збожжавымі культурамі 54%, тэхн. 3,5%, бульбай і агародніна 3,7%, кармавымі культурамі 39%. Сярод пасеваў збожжавых пераважаюць пшаніца, жыта, ячмень, авёс, гарох, з тэхн. — цукр. буракі, сланечнік. Пладаводства. Збор (тыс. т, 1999): збожжа 2584, цукр. буракоў 891, сланечніку 5,1, бульбы 1143 (1-е месца ў Расіі), агародніны 303, пладоў і ягад 39. Т. мае развітую трансп. сетку. Даўж. чыгункі 879 км, аўтадарог з цвёрдым пакрыццём 12,4 тыс. км (2000). Асн. чыгунка Масква—Казань—Екацярынбург. Суднаходства па рэках Волга, Кама, Вятка, Белая ў межах Т. на 976 км. Рачныя парты: Казань, Ніжнякамск, Набярэжныя Чаўны. Аэрапорты ў Казані, Бугульме, Набярэжных Чаўнах. Даўж. магістральных трубаправодаў (нафта- і нафтапрадуктаправоды) 6,5 тыс. км. Альмецьеўск — пач. пункт нафтаправодаў «Дружба», у Ніжні Ноўгарад, Перм, Самару. Рэспубліка пастаўляе ў інш. рэгіёны Расіі і за мяжу паліва, хім. і нафтахім. прадукцыю, аўтамабілі, дзелавую драўніну, харч. прадукты; завозіць машыны і абсталяванне, чорныя і каляровыя металы, харч. прадукты. Курорты: Бакірава, Васільеўскі, Іжэўскія Мінер. Воды.

Літаратура. Развіваецца на *татарскай мове*. Вытокі ў фальклоры і помніках сярэдневяковай цюркскай культуры. Вядомы помнікі культуры *Балгарыі Волжска-Камскай*, у т.л. паэма Кул Галі «Кыса-і-Юсуф» (13 ст.). У развіцці маст. л-ры важнае месца належыць залатаардынскаму перыяду (гуманіст. творы Кутба, М.Булгары, С.Сараі і інш.). З распадам Залатой Арды асн. цэнтрам культ. жыцця стаў г. Казань. Перыяд Казанскага ханства звязаны з творчасцю Мухамедзьяра, Умі Камала, Кул Шарыфа. Новы перыяд у развіцці тат. культуры і л-ры пачаўся пасля далучэння Казанскага ханства да Расіі (1552). У л-ры пераважалі рэлігійна-суфійскія матывы, аднак значнае месца належала свецкай тэматыцы. У 2-й пал. 17 ст. ў творчасці Маўля Кулы, Утыза Імяні, Ш.Закі, Г.Чакрыя і інш. складваецца вобраз ідэальнага ў маральных адносінах чалавека, усхваляюцца розум, гуманізм, асуджаюцца заганы ўладатрымальнікаў. Дамінуючым маст. метадам заставаўся традыц. ўсх. рамантызм. З 2-й пал. 19 ст. л-ра засвойвае еўрап. рэалізм (паэзія Г.Кандалыя, М.Акмулы, Я.Емяльянава, проза М.Ак'егетава, З.Бігеева, драматургія Г.Ільясі, Ф.Халідзі). Пач. 20 ст. — перыяд узнікнення і фарміравання новых кірункаў і маст. метадаў. Пераўтвараліся традыц. жанры, узніклі новыя, пашыралася тэматыка твораў, фарміравалася літ. крытыка, актыўна выкарыстоўваліся вопыт і дасягненні ўсх., рус. і ўсх.-еўрап. л-ры (Г.Тукай, Ф.*Амірхан*, М.*Гафуры*, Дэрдменд, Г.Ібрагімаў, Г.Камал, Ш.Камал, С.Рамеіў, Ш.Бабіч, М.Файзі і інш.). У 1920—40-я г. развівалася творчасць Ф.Бурнаша, К.*Наджмі*, Х.Такташа, К.Тынчурына, М.Галяў, А.Шамава, Х.Туфана, А.Кутуя, М.*Джаліля*, А.Аліша, Ф.Карыма, Н.Ісанбета і інш. У 1950-я г. іх традыцыі працягвалі Г.*Башыраў*, І.*Газі*, А.Файзі, Ф.Хусні, М.Амір, С.Батал, А.Енікі, С.Хакім, А.Абсалямаў, Х.Вахіт, А.Расіх. З 1960-х г. пашырыліся магчымасці для маст. аналізу з'яў мінулага і сучаснасці, у абнаўленні л-ры значную ролю адыграла плеяда «шасцідзесятнікаў» (Р.Тухватулін, А.Гілязаў, Г.Ахунаў, Н.Фатах, Ш.Галіеў, І.Юзееў, Ш.Хусаінаў), якія прынеслі ў яе надзённыя сац.-маральныя праблемы. У 1970—80-я г. праявілі сябе М.Магдзееў, Т.Мінулін, Р.Мухамадзіеў, М.Хабібулін, Ш.Бікчурын, М.Хасанаў, В.Нурулін, Р.Файзулін, Р.Харысаў, Р.Батула, Р.Гатаулін, Зульфат, М.Аглямаў і інш. У 1990-я г. ўзмацнілася ўвага да адраджэння шматвяковай гісторыка-культ. спадчыны. Вызваленае ад ідэалагізаваных прынцыпаў літаратуразнаўства імкнецца да рознабаковага асвятлення літ. працэсу, навукова-аб'ектыўнай ацэнкі маст. з'яў і тэндэнцый. У 1934 створаны Саюз пісьменнікаў Т. На бел. мове выдадзены зб-кі вершаў «Радасць сустрэч» З.*Нуры*(1973), «Маабіцкі сшытак» (1975, пер. А.Пысін



Да арт. **Татарстан**. Панарама Казанскага крамля.

і С.Гаўрусёў) і «Я гляджу на зоры» (1985, пер. Э.Агняцвет) Джаліля, аповесці «Адкуль ты, Жан?» Ш.Ракіпава (1976, пер. У.Мехаў), «Зялёная мая калыска» Башырава (1981, пер. А.Васілевіч). Паэзію і прозу перакладалі і перакладаюць М.Аўрамчык, Э.Валасевіч, В.Жуковіч, Х.Жычка, А.Звонак, І.Каленік, В.Коўтун, П.Прыходзька, Ю.Свірка, Н.Тулупава і інш.

Архітэктура. Ад 10—14 ст. захаваліся рэшткі пабудоў на тэр. гарадзішчаў Сувара, Біляра, Болгара, драўляных абарончых сцен, зрубных жылых дамоў з 2-схільным дахам і глінабітных дамоў з плоскім дахам, руіны даманголькіх каменных пабудоў. У перыяд Залатой Арды (з сярэдзіны 13 ст.) з каменю і цэглы будавалі крэпасці, палацы, мячэці (саборная мячэць, т. зв. Чорная палата ў Болгары і інш.), маўзалеі, лазні (т. зв. Чырвоная палата ў Болгары), стылістычна звязаныя з дойлідствам Сярэдняй Азіі. Будынкі ўпрыгожвалі фрэскавай размалёўкай, каляровай керамікай, арнаментальнай разьбой па камені і тынкоўцы. Пасля далучэння Казанскага ханства да Расіі архітэктура Т. развівалася ў рэчышчы рас. дойлідства: крэмль (16 ст.), кафедральны сабор (1723—26), ун-т (1825—30-я г., арх. П.Пятніцкі, М.Карынфскі) у Казані. Архітэктуры 19 — пач. 20 ст. ўласцівы эклектызм. Для нар. дойлідства характэрны драўляныя дамы (6- або 5-сценныя) з размалёўкай дэкар. дэталямі. Гасп. пабудовы падзелены на асобныя групы, ізаляваныя ад жылога дома. У 1910-я г. пашырылася грамадз. і прамысл. будаўніцтва, рэканструяваліся старыя і будаваліся новыя гарады (Набярэжныя Чаўны, Ніжнякамск і інш.). У 1920—30-я г. з'явіліся рысы канструктывізму (Дом друку ў Казані, арх. С.Пэн), пазней пачаўся зварот да традыц. форм нар. дойлідства (Тат. т-р оперы і балета імя М.Джаліля, 1953—46, арх. Н.Скварцоў, І.Гайнутдзінаў), да больш рацыянальных аб'ёмна-прасторавых вырашэнняў (рачны вакзал, арх. Гайнутдзінаў; канцэртная зала кансерваторыі, арх. М.Агішаў; цырк, арх. Г.Пічуеў і інш., усе ў Казані). З 1990-х г. у архітэктуры адраджаюцца традыц. планіровачныя прыёмы, нац. асаблівасці ў будынках жыллёвага, культавага і грамадскага прызначэння. У 1938 засн. Саюз архітэктараў Т.

Выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Найб. стараж. помнікі мастацтва на тэр. Т. — неалітычныя крамянёвыя зааморфныя фігуркі, кераміка з геам. арнаментам, пасудзіны і ўпрыгожанні эпохі бронзы. Да 19 ст. выяўл. мастацтва не развівалася (іслам забараняе выявы жывых істот). Сярод вырабаў дэкар.-прыкладнога мастацтва пераважалі сярэбраныя ўпрыгожанні з каштоўнымі і паўкаштоўнымі камянямі, залатое шыццё гладдзю, шматколерная вышыўка тамбурам, аплікацыя па тканіне, скуры, лямцы, разьба па камені і дрэве, бязворсавыя дываны, узорыстыя вырабы са скуры. З выразанымі на камені выслоўямі з Карана (т. зв. шамаілі) і першымі друкаванымі кнігамі (канец 18 — пач. 19 ст.) звязана мастацтва каліграфіі (буйнейшы майстар Алі Махмудаў). У 19 ст. жывапіс і графіка развіваліся ў творчасці рас. мастакоў, што жылі ў Казані (Л.Крукаў, В.Турын і інш.). У 1895 адкрыта Казанская маст. школа. У 1900-я г. з'явіліся тат. графікі-ілюстратары (М.Галееў, Г.Гумераў). Пасля стварэння ў Казані ў 1923 філіяла Асацыяцыі мастакоў рэв. Расіі пачалі рыхтавацца нац. кадры мастакоў (Б.Урманчэ, С.Ахун, Н.Валіулін, Ф.Тагіраў і інш.). У гады Вял. Айч. вайны працавалі М.Васільева, Г.Жыткоў, К.Максімаў, Г.Рахманкулава, Н.Сакольскі, В.Цімафееў; пашырыўся агітплакат (І.Бабравіцкі, Э.Гельмс). У 1950—80-я г. ў гіст. і быт. жанрах працавалі І.Зарыпаў, І.Рафікаў, Рахманкулава, Л.Фатахаў, І.Халілулаў, Х.Якупаў і інш.; у жанры партрэта — В.Кудзелькін, С.Ратніцкі; пейзажа — М.Кузняцоў, С.Лывін, Максімаў, М.Усманаў; у скульптуры — Урманчэ, В.Малікаў, Н.Адылаў, Г.Зябліцаў, Р.Нігматуліна; у станковай і кніжнай графіцы — Л.Кісялёва, І.Калмагорцава, Л.Пацягунін і інш. Мастацтва 1990-х г. адметнае пашырэннем жанравага і сты-



Да арт. **Татарстан**. Будынак Татарскага тэатра оперы і балета.



Да арт. **Татарстан**. Будынак Казанскага універсітэта.



Да арт. **Татарстан**. Кафедральны сабор у Казані. 1723—26.



Да арт. **Татарстан**. Старонка Карана. 19 ст.

лявога дыяпазонаў, з'яўленнем новых творчых кірункаў, адраджэннем тат. і мусульм. традыц. вобразнай сістэмы. У 1939 засн. Саюз мастакоў Т.

Тэатр. Вытокі тэатр. мастацтва Т. ў нар. гульнях і відовішчах. Першыя публічныя тэатр. пастаноўкі вядомы з 1728 (Казань). У 1791 створаны пастаянны публічны т-р. З 1802 дзейнічала антрэпрыза П.Есіпава. З пач. 19 ст. ў Казані пачалі будаваць спец. тэатр. будынкі. З 1830-х г. тут пастаянна працавалі трупы прыватных антрэпрэнёраў. Існавалі і гурткі аматараў тэатр. мастацтва. Антрэпрэнёрская дзейнасць П.Мядзведзева і М.Барадая вывела казанскі т-р на значны ўзровень выканаўчага майстэрства (ставіліся п'есы А.Грыбаедава, М.Гогаля, А.Астроўскага, А.Пісемскага, Л.Талстога, А.Чэхава і інш.). У канцы 19 — пач. 20 ст. ў Казані дзейнічалі оперныя і драм. трупы, т-ры аперэты і мініяцюр, гастраліравалі рус. акцёры (Г.Фядотава, В.Андрэеў-Бурлак і інш.). На казанскай сцэне пачыналі сваю творчую дзейнасць дзеячы рус. тэатра У.Давыдаў, П.Стрэпетава, М.Пісараў, В.Качалаў і інш. З сярэдзіны 19 ст. развіваўся тат. аматарскі т-р. У 1906 спектаклі аматараў з асяроддзя тат. інтэлігенцыі паклалі пачатак тат. прафес. т-ру (тэатр. трупы «Саяр», «Нур», «Шыркат», «Яшлек»). Сярод акцёраў і рэжысёраў Г.Балгарская, Б.Балгарскі, Ф.Ільская, Камал Першы, Г.Карыеў, Ш.Кудашаў-Іманскі, М.Мушін, З.Султанаў і інш. Творы для сцэны пісалі Ф.Амірхан, Г.Ільясы, Г.Ісхакі, Г.Камал, Ш.Камал, Г.Кулахметаў, С.Рамієў, М.Файзі, К.Тынчурын і інш. У 1920 арганізаваны Першы паказальны тат. т-р (Тат. т-р імя Г.Камала). Былі пашыраны т-ры рабочай моладзі, эксперым. трупы, дзе вяліся пошукі новых выразных сродкаў тэатр. мастацтва. Ствараліся тэатр. студыі, у 1923 у Казані адкрыўся тэатр. тэхнікум. У 1930-я г. склалася шырокая сетка перасоўных т-раў, якія пазней атрымалі статус дзярж. (Альмецьеўскі тат. драм. т-р, Мензелінскі тат. драм. т-р, Тат. рэсп. перасоўны т-р і Казанскі т-р лялек). У 1950—60-я г. пашырылася аматарскае тэатр. мастацтва. Рэпертуар тат. т-ра папоўніўся п'есамі А.Аміра, Ф.Бурнаша, Х.Вахіта, А.Гілязава, Т.Гізата, Н.Ісанбета, Р.Ішмурата, Т.Мінуліна, З.Хакіма, Р.Хаміда, І.Юзеева і інш. З імёнамі акцёраў Х.Абжалілава, Н.Арапавай, Ш.Біктэмірава, Ф.Ільскай, Г.Камскай, Х.Салімжанава, З.Султанава, Р.Газетдзінава, Х.Уразікава, Ф.Халітава, Н.Шагідарава, Ш.Шамільскага, К.Шаміля, Г.Шамукава, Р.Шарафіева і інш. звязана фарміраванне школы самабытнага акцёрскага майстэрства; Г.Дэвішаў, Г.Ісмагілаў, М.Салімжанаў, Ш.Сарымсакаў, Р.Тумашаў, Г. Юсупаў і інш. склалі школу нац. рэжысуры. У канцы 1990-х г. у Т. дзейнічалі 13 дзярж. і муніцыпальных т-раў. Праводзяцца тэатр. фестывалі, найбуйнейшы з якіх імя Ф.Тынчурына. У т-рах пастаўлены бел. п'есы: «У ціхім завулку» А.Маўзона, «Гэта было ў Мінску» А.Кампазітарскай школы Т. — С.Сайдашаў. Сярод першых тат. опер «Санія» (1925), «Рабочы» (1930) Г.Альмухамедава, В.Вінаградава, Габашы. У 1930-я г. створаны філармонія імя Г.Тукая, Дзярж. ансамбль песні і танца, Дом нар. творчасці (1937), Тат. т-р оперы і балета і Саюз кампазітараў Т. (1939). Значны ўклад у развіццё опернага жанру Н.Жыганава («Ущякач», 1939; «Залатавалосая», 1941; «Намус», 1950; «Джаліль», 1956, і інш.); лірыка-псіхал. оперу «Самат» (1956) на сучасную тэму стварыў Х.Валіулін. Аўтар першага нац. балета Ф.Ярулін («Шурале», 1941), муз. камедыі — Д.Файзі («Чаравічкі», 1942). Развіваецца сімф. і камерна-інстр. музыка, харавыя і песенныя жанры. Уклад у развіццё муз. мастацтва 20 ст. зрабілі кампазітары Ф.Ахметаў, Э.Бакіраў, Р.Бялялаў, А.Валіулін, Р.Губайдулін, Р.Енікееў, Жыганаў, А.Ключароў, А.Леман, А.Манасыпаў, М.Музафараў, Б.Мулюкоў, Файзі, З.Хабібулін, Л.Хайрутдзінава, Ш.Шарыфулін, Р.Яхін, Ярулін і інш., спевакі А.*Абасаў*, А.Асадулін, З.Байрашава, М.Булатава, Р.Ібрагімаў, А.Ізмайлава, Г.Кайбіцкая, Ф.Насрэтдзінаў, М.Рахманкулава; выканаўцы нар. песень Р.Вагапаў, Г.Сулейманава, І.Шакіраў і інш. Працуюць (2002): кансерваторыя (з 1945), муз. ф-т у пед. ін-це (з 1960), Ін-т культуры (з 1969, усе ў Казані), муз. вучылішча і школы. Праводзяцца фестывалі: сучаснай музыкі Еўропа—Азія, оперны імя Ф.Шаляпіна, класічнага балета імя Р.Нурыева (усе ў Казані). У 1997 муз. калектывы Т. прынялі ўдзел у святочных мерапрыемствах Беларусі з нагоды 600-годдзя пасялення тут абшчыны татар.



Да арт. **Татарстан**. Н.Бікулаў. На жніве.

Літ.: История Татарской АССР (с древнейших времен до наших дней). Казань, 1968; Каримуллин А. Татары: этнос и этноним. Казань, 1989; Исхаки Г. Идель-Урал. Казань, 1991; Халиков А.Х. Происхождение татар Поволжья и Приуралья. Казань, 1978; Татарский энциклопедический словарь. Казань, 1999; Татары. М., 2001; Валеев Ф.Х. Архитектурно-декоративное искусство казанских татар... Йошкар-Ола, 1975; Изобразительное искусство Советской Татарии: Альбом. М., 1983; Файнберг А.Б. Художники Татарии. Л., 1983; Червонная С.М. Искусство Татарии. М., 1987; История советского драматического театра. Т. 1—6. М., 1966—71; Исхакова-Вамба Р.А. Народные песни казанских татар. Казань, 1976; Сайдашева З.Н. Татарская советская песня. Казань, 1984; Композиторы и музыковеды Советского Татарстана. Казань, 1986.

Я.А.Якубоўскі (прырода, насельніцтва, гаспадарка),
І.Б.Канапацкі (гісторыя, літаратура, архітэктура, выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, тэатр)

ТАТА́РЫ (саманазва татар), народ цюркскай моўнай групы ва Усх. Еўропе і Паўн. Азіі. Падзяляюцца на волга-ўральскіх (або казанскіх; асн. насельніцтва Рэспублікі Татарстан у Расіі), астраханскіх, сібірскіх, крымскіх, касімаўскіх, літ. (бел.-літоўскіх) і інш. Жывуць

таксама ва Узбекістане, Казахстане, Таджыкістане, Кіргізіі, Туркменістане, Азербайджане, на Украіне, у Літве, Латвіі, Эстоніі, Польшчы і інш. Агульная колькасць 6,7 млн. чал. (сярэдзіна 1990-х г.). У Рэспубліцы Беларусь 10 089 чал. (перапіс 1999). Гавораць на *татарскай мове*. Вернікі — мусульмане-суніты, ёсць невялікія групы праваслаўных.

Традыц. жыллём Т. Сярэдняга Паволжа і Прыуралля была зрубная хата, адгароджаная ад вуліцы плотам. Знешні фасад упрыгожваўся шматколернай размалёўкай. У астраханскіх Т., якія захавалі больш стэпавых жывёлагадоўчых традыцый, летнім жыллём была юрта. Адзенне мужчын і жанчын складалася з шараваў і кашулі (у жанчын дапаўнялася вышытым нагруднікам), на якую апранаўся безрукаўны камзол. Верхнім адзеннем быў казакін, зімою — прашыты бешмет або шуба. Галаўны ўбор мужчын — цюбецейка, а паверх яе — напаўсферычная футравая шапка або лямцавы капялюш; у жанчын — вышытая аксамітная шапачка (калфак) і хустка. Традыц. абутак — скураныя ічыгі з мяккаю падэшвай. Для касцюма жанчын (асабліва багатых) было характэрна мноства метал. упрыгожанняў.

На тэр. Беларусі продкі Т. з'явіліся ў 14 ст. Вял. князі ВКЛ Гедзімін, Альгерд, Кейстут, Вітаўт і інш. запрашалі Т. з Залатой Арды і Крыма для барацьбы з Тэўтонскім ордэнам. У 1395 Вітаўт прыняў разбітага Цімурам хана Залатой Арды Тахтамыша (пасяліў у г. Ліда). У 1397 сумесна хадзілі пад Азоў (традыц. лічыцца пачаткам пасялення Т. на Беларусі) і Крым (1398), прымалі ўдзел у Грунвальдскай бітве 1410. Спачатку яны сяліліся каля Вільні, Гродна, Ліды, Навагрудка, Крэва. Да пач. 16 ст. колькасць Т. дасягала 100 тыс. чал.

У 16 — пач. 17 ст. Т. ВКЛ паступова страцілі родную мову і сталі карыстацца беларускай. На бел. і польскай мовах араб. пісьмом была створана багатая л-ра бел.-літ. Т. — *кітабы*, тэтджвіды, тэфсіры, хамаілы. Фальклор Т. вельмі блізкі да бел., а прыказкі, прымаўкі, песні, прыпеўкі і загадкі амаль не адрозніваюцца. Больш арыгінальныя паданні, легенды і вусныя апавяданні. Адбіўся бел. ўплыў і на сямейнай абраднасці Т. — азан (нарачэнне імя), вяселле, хаўтуры і інш. Т. паўплывалі і на культуру беларусаў: увялі ў бел. мову шмат цюркізмаў (па падліках Я.Якубоўскага каля 500). Т. занеслі на Беларусь высокую культуру агародніцтва, насенняводства, кветак.

У канцы 16—17 ст. становішча Т. у Рэчы Паспалітай пагоршылася. Статут ВКЛ 1588 не дазваляў Т.-феадалам мець прыгонных сялян-хрысціян. У пач. 17 ст. ў час контррэфармацыі Т. трапілі пад уціск каталіцкай царквы. У 1609, 1611, 1613 па ініцыятыве каталіцкай шляхты сойм забараніў Т. служыць ротмістрамі, паручнікамі, харунжымі. У 19 ст. на Беларусі дзейнічала 15 мячэцей (Мінск, Навагрудак, Гродна, Слонім, Мір, Клецк і інш.). Частка бел. Т. прыняла хрысціянства. У 2-й пал. 19 ст. адносна кампактныя групы Т. жылі ў Слуцкім, Навагрудскім, Ігуменскім, Ашмянскім, Брэсцкім, Пружанскім, Вілейскім паветах. У Мінскай, Віленскай, Ковенскай, Гродзенскай і Валынскай губ. паводле перапісу 1897 жыло 13 877 Т. У 1840 за тат. шляхтай паўн.-зах. губерняў прызнана права дваранства. У Зах. Беларусі існавалі Мусульманскае рэліг. аб'яднанне (з 1925), Культ.-асв. саюз Т. Рэчы Паспалітай (1926), Тат. музей у Вільні (1929). Да пач. 1980-х г. тат. культура ў БССР не развівалася. У 1989—99 работу па нац.-культ. адраджэнні Т. каардынавала Бел. згуртаванне Т.-мусульман «Аль-Кітаб» («Кніга»). Адбудаваны мячэці ў Слоніме (1994), Смілавічах (1996), Навагрудку (1997), Відзах (1999), Клецку (2000), Лоўчыцах (2002), створаны тат. культ. цэнтр у Іўі (1995). З 1991 выдаецца штоквартальнік «Байрам» («Свята»). На 1.1.2002 у Беларусі дзейнічалі 5 нац.-культ. аб'яднанняў Т.

Літ.: Татары. М., 2001; Мухлинский А. Исследование о происхождении и состоянии литовских татар. Мн., 1993 [факс. выд.: СПб., 1857]; Думін С.У., Канапацкі І.Б. Беларускія татары: Мінулае і сучаснасць. Мн., 1993; Гришин Я. Польско-литовские татары: Наследники Золотой Орды. Казань, 1995; Канапацкі І.Б., Смолік А.І. Гісторыя і культура беларускіх татар. Мн., 2000; Tyszkiewicz J. Tatarzy na Litwie i w Polsce: Studia z dziejów XIII—XVIII w. Warszawa, 1989; Bohdanowicz L., Chazbijewicz S., Tyszkiewicz J. Tatarzy muzułmanie w Polsce. Gdańsk, 1997: Dumin S. Herbarz rodzin tatarskich Wielkiego Księstwa Litewskiego. Gdańsk, 1999.

І.Б.Канапацкі.

ТАТА́РЫНАЎ Леанід Пятровіч (н. 12.11.1926, г. Тула, Расія), расійскі вучоны ў галіне заалогіі. Акад. Рас. АН (1981, чл.-кар. 1974). Скончыў Маскоўскі ун-т (1949). З 1955 у Палеанталагічным ін-це (заг. лабараторыі, у 1975—92 дырэктар), у 1973—74 у Ін-це марфалогіі і экалогіі жывёл Рас. АН. Навук. працы па ранняй эвалюцыі земнаводных, паўзуноў і млекакормячых на аснове палеанталагічных, фізіял. і біяхім. даных. Дзярж. прэмія СССР 1978.

Тв.: Териодонты СССР. М., 1974.

В.Ф.Ермакоў.

ТАТАРЫНО́ВІЧ Пётр Станіслававіч (14.6.1896, в. Гайнін Ляхавіцкага р-на Брэсцкай вобл. — 3.9.1978), бел. святар, культурна-грамадскі дзеяч, літаратар, выдавец. Д-р тэалогіі (1950), прэлат (1961). Скончыў Папскі ін-т усх. навук у Рыме (1949). У 1921 пасвячоны ў ксяндзы. У 1921—26 праводзіў душпастырства ў Пінску, Навагрудку, Баранавічах. Выдаў кн. «Святы Ізідар хлебароб» (1928), «Купалле» (1930), «Шляхам дзіваў і ўражанняў» (1934). У Вял. Айч. вайну супрацоўнічаў з Бел. нац. к-там у Варшаве, займаўся душпастырскай і выкладчыцкай працай. Удзельнік *Другога Усебеларускага кангрэса 1944* у Мінску. З 1944 у эміграцыі ў Германіі, з 1945 у Італіі. У 1949—70 кіраўнік і гал. аўтар бел. секцыі радыё Ватыкана. Выдаваў малітоўнікі. Пісаў на бел., італьян. і інш. мовах.

Літ.: Беларускія рэлігійныя дзеячы XX ст.: Жыццярысы, мартыралогія, успаміны. Мн.; Мюнхен, 1999.

А.М.Вабішчэвіч.

ТАТЛЕ́БЕН Эдуард Іванавіч (20.5.1818, г. Елгава, Латвія — 1.7.1884), расійскі ваен. і дзярж. дзеяч. Ген.-ад'ютант (1855), інж.-ген. (1869), граф (1879). Скончыў Гал. інж. вучылішча ў Пецярбургу (1836). У *Крымскую вайну 1853—56* кіраваў інж. работамі ў час *Севастопальскай абароны 1854—55*. З 1859 дырэктар інж. дэпартамента, у 1863—77 фактычна кіраваў інж. ведамствам. У 1873 чл. Асобай нарады па рэарганізацыі арміі. У рус.-турэцкую вайну 1877—78 нач. атрада аблогі крэпасці Плеўна, якая скончылася капітуляцыяй тур. гарнізона; у крас. 1878 — студз. 1879 галоўнакамандуючы рас. арміяй. У 1879—80 адэскі ген.-губернатар (часовы) і камандуючы войскамі Адэскай ваен. акругі. З 30.5.1880 віленскі, ковенскі і гродзенскі ген.-губернатар і камандуючы войскамі Віленскай ваен. акругі. У вер. 1880 кіраваў ваен. манеўрамі ў раёне Новых Трокаў. Аўтар дапаможнікаў па падрыхтоўцы сапёрных часцей і па мінной справе. Пад яго кіраўніцтвам выдадзена «Апісанне абароны г. Севастопаля» (т. 1—2, 1863—72).

А.М.Лукашэвіч.

«ТА́ТРА» (Tatra), сям'я аўтамабіляў аднайм. чэшскага прадпрыемства. Легкавыя аўтамабілі выпускаюцца з 1897. Маюць размешчаны ззаду бензінавы рухавік магутнасцю да 148 кВт (найб. скорасць да 230 км/гадз). Поўнапрывадныя грузавыя аўтамабілі выпускаюцца з 1900. Маюць трубчастую раму, незалежную падвеску колаў, разлічаны на эксплуатацыю ва ўмовах бездарожжа. Дызельны рухавік з турбанаддувам магутнасцю да 252 кВт, поўная маса аўтамабіля да 36 т (аўтапоезда да 44 т).



1



2

Сям'я аўтамабіляў «**Татра**»: 1 — легкавы аўтамабіль мадэль 613; 2 — грузавік 200 V 51.19.225.

ТАТРА́НСКІ НАЦЫЯНА́ЛЬНЫ ПАРК, ахоўны ўчастак тэр. Карпат (Высокія Татры) у Славакіі (пл. 50 тыс. га, засн. ў 1954) і Польшчы (пл. 22 тыс. га, засн. ў 1948). Ахова пераважна хвойных лясоў і жывёл (мядзведзь, серна, казуля, сурок, рысь). На тэр. парку створаны за-

паведнікі, гадавальнікі дзікіх жывёл, паляўнічыя рэзервацыі. Асобныя ўчасткі выкарыстоўваюцца як зімовыя і летнія курорты.

ТА́ТРЫ (Tatry), горны масіў у Польшчы і Славакіі, самы высокі ў Карпатах. Даўж. 65 км, выш. да 2655 м (г. Герлахаўскі-Шціт, найвышэйшы пункт Карпат). Далінамі рэк Ваг і Горнад падзелены на Высокія і Нізкія Татры. Высокія Татры складзены з гранітаў, гнейсаў, маюць зубчаты грэбень, альпійскія формы рэльефу (трогі, цыркі, каравыя азёры). У Нізкіх Татрах трапляюцца таксама вапнякі з карставымі формамі рэльефу. Т. моцна ўвільготнены атл. цыклонамі на працягу года (800—1200 мм за год). Снегавое покрыва 6—8 месяцаў. Вясной і восенню характэрны вятры фены. У раслінным покрыве — дубова-букавыя лясы да выш. 700 м, букавапіхтавыя лясы да выш. 1200 м, субальпійскае хваёвае крывалессе з зараснікамі рададэндрану і чарнічніку да 1800 м, вышэй альпійскія лугі і камяністыя россыпы. *Татранскі нацыянальны парк.* Цэнтры зімовага спорту (Закапанэ і інш.). Курорты. Турызм. *М.В.Лаўрыновіч.*

ТАТУІРО́ЎКА (франц. tatouer татуіраваць, з палінез.), нанясенне на цела чалавека ўзораў і малюнкаў шляхам наколвання на скуры драўлянай, касцяной ці метал. іголкай і ўвядзення пад яе фарбы, якая не змываецца. У першабытных народаў Т. была знакам роду, племя, татэма (у цемнаскурых замянялася рубцаваннем). Звычай татуіравання ў час *ініцыяцый* меў сімвалічны і магічны (засцерагальны) характар; у Еўропу завезены маракамі з Паўн.-Усх. Азіі. Т. захавалася як упрыгожанне, памятны знак, пашырылася ў 21 ст. як т. зв. нацельны жывапіс. Т. наз. таксама ўзоры і малюнкі, нанесеныя на скуру.

ТА́ТУР Генрык Хрыстафаравіч (1846, Мінск — 1907), бел. археолаг, гісторык, краязнавец, калекцыянер. Чл. Мінскага статыстычнага к-та, павятовы маршалак дваранства. З 1874 вёў археал. раскопкі ў Мінскай губ., склаў яе археал. карту з апісаннем помнікаў. У 1884—85 засноваў часовы археал. музей у г. Беразіно, дзе ў наваколлі вёў раскопкі. У 1890 ён раскапаў 120 курганоў каля в. Дулебы і Няюнішчы Ігуменскага пав., у 1892 — 40 курганоў каля в. Станькава, у 1893 — 40 курганоў каля в. Прылукі Мінскага пав. У выніку паездак па Міншчыне падрыхтаваў вял. альбом археал. помнікаў (1893). Стварыў у Мінску багаты прыватны музей па гісторыі матэрыяльнай культуры Беларусі і унікальную б-ку. Пасля смерці яго зборы былі прададзены, многія вывезены за мяжу. Аўтар прац «Археалагічнае значэнне Мінскай губерні» (1878), «Нарыс археалагічных помнікаў на прасторы Мінскай губерні і яе археалагічнае значэнне» (1892), якія выдадзены ў Мінску. У рукапісах засталіся «Гістарычны нарыс мястэчка Турава, ранейшай сталіцы ўдзельнага Тураўскага княства», «Гісторыя Станькава», «Гісторыя Заслаўя».

Літ.: Алексеев Л.В. Археология и краеведение Беларуси, XVI в. — 30-е гг. XX в. Мн., 1996. *Г.А.Каханоўскі.*

ТА́ТУР Мікола (Мікалай Ігнатавіч; 3.3.1919, урочышча Застар'е Клічаўскага р-на Магілёўскай вобл. — 24.3.2001), бел. перакладчык. Скончыў Мінскі настаўніцкі ін-т нацменшасцей (1937). Настаўнічаў, з 1944 працаваў у Дзярж. выд-ве БССР, з 1963 у выд-ве «Полымя», Бел. аддз. літ. фонду СССР, у 1970—79 у Бюро прапаганды маст. л-ры Саюза пісьменнікаў Беларусі. Друкаваўся з 1948. Пераклаў на бел. мову многія творы рус., укр., польскіх і інш. пісьменнікаў: аповесці А.Гайдара «Школа» (1948), А.Мусатава «Стажары» (1950), раманы В.Ажаева «Далёка ад Масквы» (1951; з У.Шахаўцом), М.Нікіціна «Паўночная Аўрора» (1953; з В.Зубам), У.Кочатава «Журбіны» (1955), К.Брандыса «Грамадзяне» (1958; з Я.Міско), А.Венцлавы «Дзень нараджэння» (1961; з С.Дзяргаем), Г.Лупан «Трэція пеўні» (1971), Э.Бээкман «Чародка белых варон» (1973), А.Ірасека «Скалакі» (1974; з Я.Васілёнкам), У.Умарбекава «Зялёная зорка» (1976), апавяданні А.Вішні, Л.Первамайскага, С.Лема, Я.Гушчы, Я.Івашкевіча, М.Твэна і інш.; для тэатраў — творы Назыма Хікмета, Б.Васільева, Л.Зорына, А.Ліндгрэн, Г.Запольскай і інш. Пісаў літ.-крыт. артыкулы, эпіграмы. *І.У.Саламевіч.*

ТАТЫШВІ́ЛІ Цысана Бежанаўна (н. 30.12.1937, Тбілісі), грузінская спявачка (сапрана). Нар. арт. СССР (1979). Скончыла Тбіліскую кансерваторыю (1963). З 1963 у Груз. т-ры оперы і балета. Сярод партый: Этэры («Абесалом і Этэры» З.Паліяшвілі), Ліза («Пікавая дама» П.Чайкоўскага), Аіда, Эбалі, Дэздэмона («Аіда», «Дон Карлас», «Атэла» Дж. Вердзі), Тоска («Тоска» Дж.Пучыні), Артруда («Лаэнгрын» Р.Вагнера), Саламея («Саламея» Р.Штрауса). Выступае таксама ў канцэртах. Дзярж. прэміі Грузіі 1979, 1987.

ТАТЭ́М (англ. totem ад індз. ататэм — яго род), 1) жывёла, расліна, прадмет ці з'ява прыроды, якія служаць аб'ектам шанавання пэўнай родавай групы. Кожны род меў свой Т. і насіў яго назву (гл. *Татэмізм*). 2) Герб з выявай жывёлы, расліны, прадмета ці з'явы прыроды, якія з'яўляюцца аб'ектам шанавання.

ТАТЭМІ́ЗМ, комплекс вераванняў і абрадаў у абшчынна-родавым грамадстве, звязаны з уяўленнем пра роднасць паміж групай людзей (родам, фратрыяй) і *татэмам*. Сярод татэмаў пераважалі жывёлы, што абумоўлена пераважаннем паляўніцтва ў абшчынна-родавым грамадстве. Татэмаў паважалі, часам абагаўлялі, не прычынялі ім шкоды (іх нельга было забіваць, есці іх мяса дазвалялася толькі ў час татэмных свят), імкнуліся іх аберагаць, спрыяць павелічэнню іх колькасці. Кожная татэмная група насіла імя свайго татэма, а яе члены мелі спец. татэмічныя эмблемы (камень, дошчачка); існавала забарона на заключэнне шлюбаў унутры татэмных груп. Дзеля «задобрывання» татэма-жывёлы і павелічэння яго колькасці людзі выконвалі спец. магічныя абрады, песні-заклінанні, татэмічныя танцы, у якіх звычайна імітаваліся паводзіны татэмаў.

Класічны Т. зафіксаваны ў Аўстраліі. Існуе некалькі канцэпцый узнікнення Т.: боязь жывёл (найперш драпежных); адчуванне сваёй натуральнай еднасці з жывёламі і раслінамі; вера ў існаванне свяшчэнных (сакральных) прыродных сіл і з'яў. У некат. народаў Амерыкі, Азіі, Афрыкі, Акіяніі рэшткі Т. захаваліся да нашага часу. Яны выяўляюцца ў разнастайных формах: выявах татэмічных істот на сценах дамоў і на дэталях адзення; звычаях урачыстага пахавання памерлых татэмаў; выкарыстанні ў якасці абярэгаў асобных частак цела татэмных жывёл (зубы, скура, галава, пер'е, косці); клятва на частках цела татэмных жывёл; звычай пераапранання ў скуру жывёл у час свят, рытуальныя татэмічныя танцы; легенды, паданні, казкі пра паходжанне роду ад пэўнага татэма.

У беларусаў захаваліся нар. легенды і паданні, прыкметы і павер'і, у якіх адзначаюцца рэшткі стараж. Т. У асобных бел. фальклорных творах распавядаецца, што людзі часам ператвараліся ў мядзведзяў, буслоў, ваўкоў. Праявамі Т. з'яўляюцца наступныя вызначэнні асобных жывёл: мядзведзя наз. «продкам», «апекуном», бусла — «братам» і г.д. У бел. фальклоры найчасцей сустракаюцца звесткі пра мядзведзя, які быў найб. паважанай жывёлінай. Ён лічыўся адным з самых магутных звяроў у лесе (таму яго баяліся і імкнуліся задобрыць), а таксама шмат у чым нагадваў самога чалавека (напр., мог хадзіць на задніх лапах, любіў есці мёд, гарохавую кашу, кісель). На Беларусі працяглы час захоўвалася свята татэмнага паходжання *камаедзіца*. У бел. фальклоры сустракаюцца павер'і, паводле якіх, напр., калі мядзведзь пройдзе каля «зачараванай» хаты, то можа адвесці няшчасці, і інш. Карані Т. і ў звычаі пераапранання ў скуру мядзведзя ў час нар. свят (напр., *Каляд*).

Літ.: Богданович А.Е. Пережитки древнего миросозерцания у белорусов. Мн., 1995 [рэпр. выд.: Гродно, 1895]; Арсеньев В.Р. Звери—боги—люди. М., 1991; Ненадавец А.М. Святло таямнічага вогнішча. Мн., 1993; Волошина Т.А., Астапов С.Н. Языческая мифология славян. Ростов н/Д, 1996; Соколова З.П. Животные в религиях. СПб., 1998. *Э.С.Дубянецкі.*

ТАТЭ́ЎСКІ МАНАСТЫ́Р, помнік сярэдневяковага дойлідства ў с. Татэў (Арменія). Засн. ў 9 ст. як мужчынскі. Рэзідэнцыя Сюнікскага мітрапаліта. Размешчаны над глыбокай цяснінай. Арх. комплекс уключае цэрквы Грыгорыя (836—848), Пагоса і Петраса (895—906), надбрамную Аствацацын (11 ст.), культавы манумент — слуп, які гойдаецца (904), крапасныя сцены, жылыя і гасп. пабудовы 17—18 ст. На

тэр. Т.м. размяшчаецца культ. цэнтр з ун-там, скрыпторыем, б-кай.

ТАЎЙСКАЯ ГУБА́, заліў у паўн.-зах. ч. Ахоцкага м., паміж п-авамі Хміцеўскага і Коні (Магаданская вобл., Расія). Даўж. 75 км, сярэдняя шыр. 120—130 км, сярэдняя глыб. 40—50 м. Узбярэжжа парэзана залівамі і бухтамі (Амахтонскі зал., Нагаева бухта і інш.). Каля ўвахода ў заліў — а-вы Спафар'ева і Заўялава. Прылівы няправільныя, паўсутачныя (да 5 м). У бухце Нагаева — г. Магадан і порт Нагаева.





Г.**Таўбе**.



Ю.**Таўбін**.

В.А.**Таўкачоў**.

ТАЎБЕ (Taube) Генры (н. 30.11.1915, г. Саскатун, Канада), амерыканскі фізікахімік. Чл. Нац. АН ЗША (1959), Амер. акадэміі мастацтваў і навук (1961). Скончыў Саскачэванскі ун-т (г. Рэджайна; 1937). З 1937 у Каліфарнійскім ун-це (г. Берклі; д-р філасофіі, 1940). З 1941 у Корнелскім (г. Ітака), з 1946 у Чыкагскім (з 1952 праф.), з 1962 у Станфардскім ун-тах. Навук. працы па даследаванні механізмаў рэакцый з пераносам электрона, пераважна ў водных растворах з удзелам комплексаў пераходных металаў. Даказаў (на прыкладзе трохвалентнага іона хрому) існаванне сальватаванага катыёну ў водным растворы (канец 1940-х г.). Нобелеўская прэмія 1983.

ТАЎБІН Юлі (Юдаль Абрамавіч; 15.9.1911, г. Астрагожск Варонежскай вобл., Расія — 30.10.1937), бел. паэт. У 1921 з бацькамі пераехаў у г. Мсціслаў Магілёўскай вобл. Вучыўся ў БДУ (1931—33). У 1933 рэпрэсіраваны, высланы ў Цюмень, у 1937 зноў арыштаваны. Расстраляны ў Мінску. Рэабілітаваны ў 1956 і 1957. Друкаваўся з 1926. Аўтар зб-каў паэзіі «Агні» (1930), «Каб жыць, спяваць і не старэць...», «Тры паэмы» (абодва 1931), «Мая другая кніга» (1932). Матывы сяброўства, прызначэння паэта і паэзіі ў творах 1920-х г. Рамантычна апяваў сучаснасць (паэма «Таўрыда», 1932). Пераклаў на бел. мову творы Г.Гейнэ, У.Маякоўскага, А.Чэхава і інш.

Тв.: Выбр. вершы. Мн., 1957; Вершы. Мн., 1969.

Літ.: Бярозкін Р. Постаці. Мн., 1971. С. 165—193; Шушкевіч С. Вяртанне ў маладосць. Мн., 1968.С. 126—137.

ТАЎГЕНЬ Алег Ігнатавіч (н. 6.10.1962, г. Валожын Мінскай вобл.), бел. матэматык. Д-р фіз.-матэм. н. (1993), праф. (1995). Чл. кар. Бел. акадэміі адукацыі (1997). Скончыў БДУ (1984). З 1984 у Ін-це матэматыкі Нац. АН Беларусі. З 1992 у Ін-це павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў адукацыі (прарэктар). З 1999 у Акадэміі паслядыпломнай адукацыі (прарэктар; з 2000 рэктар). Адначасова з 1991 у БДУ (з 1998 заг. кафедры). Навук. працы па алгебры, методыцы выкладання матэматыкі, праблемах інфарматызацыі адукацыі. Распрацаваў камбінаторныя метады ў тэорыі лінейных груп. Вырашыў праблему Гратэндыка аб праканечных папаўненнях груп. Аўтар падручнікаў і навучальных дапаможнікаў для сярэдняй школы.

Тв.: Алгебра. 4 выд. Мн., 1997 (у сааўт.); Методы решения задач по математике: В 2 т. Т. 1. Мн., 2000 (разам з Ан.І.Таўгенем).

М.П.Савік.

ТАЎКАНІ́ЦА, бел. нац. страва; тоўчаная бульбяная каша. Называлі таксама таўпеня. Чышчаную бульбу вараць, адцэджваюць, таўкуць, заскварваюць салам з цыбуляй. Ядуць з малаком, агуркамі, капустай. Часта з Т. рабілі *камы*, таўчонікі — галушкі, якія падсмажвалі ў масле, тлушчы або абкочвалі ў канапляным семі і падсмажвалі ў печы. Вядома паўсюдна, а пад назвай Т. — на Гродзеншчыне, Палессі. *Г.Ф.Вештарт.*

ТАЎКАЧО́Ў Віталь Антонавіч (н. 28.6.1934, в. Скірмантава Дзяржынскага р-на Мінскай вобл.), бел. фізік. Акад. Нац. АН Беларусі (2000, чл.-кар, 1984). Д-р фіз.-матэм. н. (1980), праф. (1990). Скончыў БДУ (1957). З 1957 у Ін-це фізікі, з 1992 у Ін-це малекулярнай і атамнай фізікі Нац. АН Беларусі (з 1984 заг. лабараторыі). Навук. працы па малекулярнай спектраскапіі, квантавай электроніцы. Распрацаваў тэорыю статыст. фарміравання фотафіз. характарыстык свабодных складаных малекул і прапанаваў метады іх эксперым. вывучэння. Стварыў лазер на электронных пераходах свабодных складаных малекул. Выявіў і даследаваў палярызацыю стымуляванага выпромянення і палярызаванай флюарэсцэнцыі арыентацыйна анізатропнай пары складаных малекул. Устанавіў механізм дынамікі малекулярнага вярчальнага рэха. Ленінская прэмія 1980. Дзярж. прэмія Беларусі 1998.

Тв.: О связи средних энергий сложных молекул, комбинирующих в поглощении и испускании // Журн. прикладной спектроскопии. 1978. Т. 29, № 6; Генерация излучения сложными молекулами в газовой фазе (разам з М.А.Барысевічам) // Успехи физ. наук. 1982. Т. 138, № 4; Динамика молекулярного вращательного эха // Докл. Нац. АН Беларуси. 1998. Т.42, № 3.

ТАЎКАЧЫ́, вёска ў Таўкачоўскім с/с Шклоўскага р-на Магілёўскай вобл. Цэнтр калгаса. За 15 км на ПдЗ ад г. Шклоў, 38 км ад Магілёва, 12 км ад чыг. ст. Лотва. 117 ж., 52 двары (2002). Клуб. Брацкая магіла сав. воінаў.

ТАЎКА́ЧЫК, споравая расліна, гл. ў арт. *Хвошч*.

ТАЎКА́ЧЫК, род шапкавых грыбоў, тое, што *паплавок*.

ТАЎКА́ЧЫКІ, таўкачы, танцоркі (Empididae), сямейства насякомых падатр. прамашыўных каратказусых атр. двухкрылых. Больш за 2,8 тыс. відаў. Пашыраны ўсюды, асабліва ў лясной зоне па берагах вадаёмаў; жывуць на раслінах. На Беларусі найб. трапляюцца Т.: вялікі (Empis tesselata) і ліндзнеры (E. lindneri).

Даўж. да 15 мм. Цела цёмнае, слабаапушанае. Галава невял., круглая з іголкападобным хабатком. Крылы празрыстыя. Ногі доўгія,

ТАЎАНТЫНСУ́Ю (на мове кечуа — чатыры злучаныя стараны свету), імперыя *інкаў* у 15 — пач. 16 ст. Стварэнне Т. пачалося з часу заваёўніцкіх паходаў інкскага правіцеля (сапа інка) Пачакутэка [1438—63]; працягваліся ў час кіравання Амару Інка Юпанкі [1463—71] і Тупак Інка Юпанкі [1471—93]. Пры Уайне Капаку [1493—1525] Т. ахоплівала тэр. сучасных Перу, Балівіі, Эквадора, ч. тэр. Аргенціны і Чылі. Яна падзялялася на 4 часткі (сую): Кальясую, Кандэсую, Чынчасую і Антысую, што павінна было сімвалізаваць вяршэнства вярх. правіцеля Т. над усімі 4 старанамі свету. Дзярж. лад Т. ўяўляў дэспатыю, пры якой вярх. правіцель спалучаў функцыі рэліг. і адм. улады. Пасля смерці ў 1525 Уайна Капака пачаліся міжусобіцы і грамадз. войны. Правіцель Атаўальпа захоплены ў палон іспанцамі на чале з Ф.*Пісара* і ў 1533 пакараны смерцю. Пасля гэтага тэр. Т. ўключана ў склад ісп. калан. уладанняў, хоць інкі працягвалі барацьбу ў цяжкадаступных раёнах; іх апошні правіцель *Тупак Амару* ўзяты іспанцамі ў палон і пакараны смерцю ў 1572.

Літ.: Кузьмищев В.А. Царство сынов Солнца. 2 изд. М., 1985; Стингл М. Государство инков: Слава и смерть «сыновей Солнца»: Пер. с чеш. М., 1986; Березкин Ю.Е. Инки: Ист. опыт империи. М., 1991; Инки: владыки золота и наследники славы: Пер. с англ. М., 1997.

ТАЎБАТЭ (Taubaté) горад на ПдУ Бразіліі, у даліне р. Параіба, штат Сан-Паўлу. Засн. ў 1646. Каля 200 тыс. ж. (2001). Чыг. станцыя, вузел аўтадарог. Аэрапорт. Прам-сць: аўтамаб., ліцейная вытв-сць, тэкст., харчовая. Ун-т. Арх. помнікі 17 ст. Паблізу здабыча каштоўных сланцаў.

тонкія. Пераважна драпежнікі, дадатковы корм — нектар кветак. У перыяд размнажэння ў некат. відаў адбываецца раенне, шлюбныя «танцы», насякомыя збіраюцца ў вял. масы — «таўкуць мак» (адсюль назва). Агрэсіўныя самкі пасля капуляцыі нярэдка з'ядаюць самцоў. Развіццё з поўным ператварэннем. Лічынкі жывуць у глебе, лясным подсціле, у некат. відаў — на дне вадаёмаў.

С.Л.Максімава.

«ТАЎКА́ЧЫКІ», старадаўні бел. нар. танец-гульня. Імітуе працэс абівання і таўчэння зерня ў ступе. Муз. памер 2/4. Тэмп жвавы. Вядомы ў 2 харэагр. варыянтах: як гульня-карагод і ілюстрацыйна-выяўленчы гульнявы танец. «Т.» — гульня-карагод выконваецца парамі ці групамі ўдзельнікаў, якія пад песню ці прыпеўку рухаюцца ў квадратах з лучынак, раскладзеных накрыж на падлозе, і стараюцца не зачапіць іх, што вымагае вял. майстэрства. Танц. варыянт мае тую ж сэнсавую нагрузку, але можа выконвацца сола ці парамі ў суправаджэнні песні, прыпевак або пад акампанемент дудкі са скрыпкай. На Беларусі найб. пашыраны ў Віцебскай, Гродзенскай, Брэсцкай абл. У 1913 «Т.» выкарыстаны ў спектаклі па п'есе Я.Купалы «Прымакі», у 1920-я г. ў спектаклі БДТ па п'есе «Машэка» Е.Міровіча (паст. К.Алексютовіча), у аднайм. тэлеспектаклі бел. тэлебачання (1984). Падобны танец вядомы ў некат. народаў балт. рэгіёна.

В.М.Яшчанка.

ТАЎЛА́Й Валянцін Паўлавіч (8.2.1914, г. Баранавічы Брэсцкай вобл. — 27.4.1947), бел. паэт, дзеяч рэв.-вызв. руху ў Зах. Беларусі. Маленства правёў на радзіме бацькоў, у в. Рудаўка Слонімскага р-на. Вучыўся ў Слонімскай настаўніцкай семінарыі (у 1925 выключаны за нежаданне адмовіцца ад бел. нацыянальнасці), у 1927—29 у Віленскай бел. гімназіі (выключаны як адзін з арганізатараў вучнёўскай забастоўкі). За падпольную камсамольскую дзейнасць арыштаваны і зняволены ў слонімскую турму, потым у гродзенскі астрог (1929—30). У 1930—32 працаваў у газ. «Звязда» і вучыўся ў БДУ. У снеж. 1932 адкліканы на падп. працу ў Зах. Беларусь — чл. цэнтр. рэдакцыі КПЗБ у Варшаве, адзін з фактычных рэдактараў «Беларускай газеты» і яе дадатку час. «Літаратурная старонка» — легальных неафіц. органаў КПЗБ у Вільні. Прадстаўнік ЦК КПЗБ у Цэнтры нац.-вызв. руху Зах. Беларусі. Адзін з арганізатараў Літ. фронту сялянска-рабочых пісьменнікаў. Пры спробе перайсці граніцу ў Сав. Беларусь у 1934 арыштаваны, засуджаны на 8 гадоў зняволення ў гродзенскі астрог. Пасля вызвалення Зах. Беларусі працаваў у лідскай раённай газ. «Уперад» (1939—41). У Вял. Айч. вайну сувязны партыз. атрада імя Катоўскага брыгады імя Дзяржынскага Баранавіцкай вобл., разведчык спецгрупы «Буравеснік» (1942—44). У 1944—45 адказны сакратар навагрудскай раённай газ. «Звязда», у 1945—47 ст. навук. супрацоўнік і нам. дырэктара Літ. музея Я.Купалы. Друкаваўся з 1928. Меў псеўданімы Бунтарны, Янка Дванаццаты, Паўлюк Сірата, В.Тарскі і інш. Як паэт-рэвалюцыянер фарміраваўся ў камуніст. падполлі (паэма «Непераможная», выд. на шапірографе, 1928). У першым пасмяротным зб. «Выбранае» (1947) палымяныя паэтычныя цыклы астрожных вершаў («Лукішскія вершы», «Таварышу маёй вясны», «Бацьку») і паэм («Таварыш», «Песня пра сухар»). Раскрыў мужнае аблічча рэвалюцыянера 1930-х г., характэрныя рысы якога — глыбокае лірычнае перажыванне і ўнутр. гатоўнасць высокага ахвяравання, асэнсаванне сутнасці пройдзеных змагарных шляхоў і барацьбы як усечалавечай праблемы разняволення свету, абнаўлення жыцця. Над паглыбленнем зместу вершаў і паэм працаваў усё творчае жыццё, даводзячы іх да гранічнай маст. дасканаласці. Эстэт. набытак Т. ўзнімаецца на ўзровень рэв. паэзіі свету. Аўтар публіцыст. нарысаў пра рэв.-вызв. і антыфаш. барацьбу, літ.-крытычных артыкулаў пра творчасць Я.Купалы, П.Пестрака, Я.Брыля. Пераклаў на бел. мову асобныя творы А. Міцкевіча, І.Крылова.

Тв.: Вершы і паэмы. Мн., 1955; Выбр. творы. Мн., 1958; Творы. Мн., 1961; [Выбр. вершы і паэмы]. Мн., 1967; Пілую вершам краты. Мн., 1984.

Літ.: Арочка М. Валянцін Таўлай. Мн., 1969; Калеснік У. Аповесць пра Таўлая // Полымя. 1964. № 10; 1965. № 8—9; Валянцін Таўлай: Дак., успаміны, артыкулы. Мн., 1984.

М.М.Арочка.

ТАЎЛА́Й Галіна Валянцінаўна (н. 22.9.1946, Мінск), бел. этнамузыколаг. Дачка В.П.*Таўлая*. Канд. мастацтвазнаўства (1983). Скончыла Бел. кансерваторыю (1970). У 1965—73 выкладала ў муз. школах Мінска. З 1985 у Ін-це мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Бел. АН. З 1996 у Рас. ін-це гісторыі мастацтваў. Даследуе праблемы функцыянавання, стылістыкі, этнагр. кантэксту, муз. тыпалогіі, мелагеаграфіі бел. песеннага фальклору. Аўтар манаграфіі «Беларускае купалле. Абрад, песні» (1986), муз. раздзелаў у тамах серыі «Беларуская народная творчасць»: «Сямейна-бытавыя песні» (1984), «Купальскія і пятроўскія песні» (1985), «Сацыяльна-бытавыя песні» (1987), «Радзіны: Абрад, песні» (1998).

Т.Б.Варфаламеева.



Таўкачык вялікі.

ТАЎНС (Townes) Чарлз Хард (н. 28.7.1915, г. Грынвіл, штат Паўд. Караліна, ЗША), амерыканскі фізік, адзін з заснавальнікаў квантавай электронікі. Чл. Нац. АН ЗША (1956), Амер. акадэміі мастацтваў і навук (1957), Лонданскага каралеўскага т-ва (1976). Замежны чл. Рас. АН (1994). Скончыў Каліфарнійскі тэхнал. ін-т (1939). З 1939 у фірме «Бел тэлефон лабаратарыс», з 1948 у Калумбійскім ун-це (з 1950 праф.). З 1959 у Ін-це абаронных даследаванняў (віцэ-прэзідэнт, г. Вашынгтон). З 1961 у Масачусецкім тэхнал. ін-це, з 1967 у Каліфарнійскім ун-це (г. Берклі). Навук. працы па мікрахвалевай спектраскапіі, квантавай электроніцы, радыё- і інфрачырвонай астраноміі, радыёлакацыі, астрафізіцы. Распрацаваў прынцыпы ўзмацнення і генерацыі эл.-магн. выпрамянення ў квантавых сістэмах (1951; незалежна ад М.Г.*Басава* і А.М.*Прохарава*), стварыў першы мазер (1953). Прапанаваў прынцып работы лазера (1958; разам з А.Л.*Шаўлавым*). Выкарыстаў мазеры для высокадакладнага пацвярджэння спец. тэорыі адноснасці (1958—63). Разам з інш. прадказаў эфект самафакусіроўкі светлавога пучка (1964; незалежна ад Г.А.Аскар'яна). Выявіў малекулы вады ў міжзорнай прасторы і паказаў, што іх радыёвыпрамяненне абумоўлена мазерным механізмам (касм. мазер; 1969). Нобелеўская прэмія 1964 (разам з Басавым, Прохаравым). Залаты медаль імя Бора 1979. Вял. залаты медаль імя Ламаносава Рас. АН 2000.



В.П.**Таўлай**.



Ч.Х.**Таўнс**.

Тв.: Рус. пер. — Радиоспектроскопия. М., 1959 (разам з А.Шаўлавым); Слияние науки и религии // Диалоги. М., 1979; Что происходит в центре нашей Галактики? (разам з Р.Гензелам) // В мире науки. 1990. № 6.

М.М.Касцюковіч.

ТАЎПЕ́КА Аляксандр Рыгоравіч (1914, в. Доктаравічы Капыльскага р-на Мінскай вобл. — 21.6.1944), Герой Сав. Саюза (1944). У Вял. Айч. вайну з 1941 на Ленінградскім фронце. Камандзір мінамётнага разліку старшына Т. вызначыўся 14.6.1944 у час прарыву абароны ворага на Карэльскім перашыйку і пры вызваленні г. Выбарг. Загінуў у баі.

ТАЎР, Т о р а с (Toros'lar), горы на Пд Турцыі. Цягнуцца ўздоўж узбярэжжа Міжземнага м. прыблізна на 1000 км. Выш. да 3726 м (г. Дэмірказык). Утвараюць паўд. ўскраіны Малаазіяцкага і часткова Армянскага нагор'яў. Складзены пераважна з вапнякоў і крышт. сланцаў. У цэнтр. ч. альпійскі рэльеф, на З — карставыя ландшафты. На паўн. схілах да 400 мм ападкаў за год; пустыні і стэпы, на паўд. да 3000 мм; міжземнаморскія лясы, хмызнякі, лугі. Нац. паркі. Т. праразаюць *Кілікійскія Вароты.*



А.Р.**Таўпека**.



Г.А.**Таўстаногаў**.

ТАЎРАМЕ́НІЙ (Taormina), старажытнагрэчаскі горад на ўсх. узбярэжжы Сіцыліі (цяпер г. Таарміна, Італія). Засн. ў 396 да н.э. сікуламі, эліпізаваны бежанцамі з в-ва Наксас у 358 да н.э. У 1-ю Пунічную вайну Т. адзін з першых на Сіцыліі прызнаў рым. ўладу, за што атрымаў права саюзнай абшчыны. У час



Таўрт. Камень. Каля 650 да н.э.

1-га Сіцылійскага паўстання рабоў (гл. *Сіцылійскія паўстанні рабоў)* важны апорны пункт паўстанцаў. Рабы дадаткова ўмацавалі Т., і рым. войскі здолелі захапіць горад толькі пры дапамозе здрады. У 34 да н.э. ў Т. засн. рым. калонія. *А.Г.Зельскі.*

ТАЎРО́ (цюрк.), кляймо, якое выпальваюць на скуры ці рагах жывёл (гл. *Мечанне жывёл*), таксама назва прылады для нанясення такога кляйма.

ТАЎРТ, у старажытнаегіпецкай рэлігіі і міфалогіі багіня-апякунка жанчын і дзяцей. Яе найчасцей уяўлялі цяжарнай самкай бегемота (свяшчэнная жывёла Т.), якая стаіць вертыкальна на львіных нагах, мае жаночыя рукі і грудзі. Лічылася, што Т. дапамагае жанчынам пры родах, лечыць іх ад бясплоднасці; што яна звязана з замагільным светам, разам з багіняй *Хатор* сустракае памерлых на парозе падземнага царства і з дапамогай агню адганяе ад іх злых духаў. Цэнтр культу Т. — г. *Фівы*. Яе выявы часта змяшчалі на амулетах, ложках і інш. прадметах.

ТАЎРЫ́З, горад у Іране, гл. *Тэбрыз.*

ТАЎРЫЗІ́ЯН Міхаіл Арсеньевіч (27.5.1907, Баку — 17.10.1957), армянскі дырыжор. Нар. арт. СССР (1956). Скончыў Ленінградскую кансерваторыю (1934). З 1935 дырыжор, з 1938 гал. дырыжор, з 1946 маст. кіраўнік Арм. т-ра оперы і балета. Сярод яго паст. першыя арм. оперы, у т.л. «Аршак II» Т.Чухаджана, «Гераіня» А.Сцепаняна. Выступаў і як сімф. дырыжор. Дзярж. прэміі СССР 1946, 1951.

ТАЎРЫ́ЧАСКІ ПАЛА́Ц, помнік архітэктуры ранняга класіцызму ў Санкт-Пецярбургу. Пабудаваны ў 1783—89 (арх. І.Староў, з удзелам Ф.Волкава) для кн. Р.А.Пацёмкіна. Пасля пажару адбудаваны ў 1802—04 (арх. Л.Руска, К.Росі, В.Стасаў; размалёўкі 1819, маст. Дж.Скоці). Будынак П-падобны ў плане, гал. фасад аформлены манум. порцікам іанічнага ордэра. У інтэр'еры 8-вугольная купальная зала, Вял. галерэя з іанічнай каланадай, зімовы сад.

ТА́ЎРЫЯ, гістарычная назва Крымскага п-ва з 16 ст. У 19 — пач. 20 ст. Т. называлі не толькі Крым, але і сумежныя з ім паўн. раёны Таўрычаскай губ. (т. зв. Паўн. Таўрыя).

«ТА́ЎРЫЯ», пярэднепрывадны легкавы аўтамабіль, гл. ў арт. *ЗАЗ.*

ТАЎСТАДЗЮ́БЫЯ СІНІ́ЦЫ (Paradoxornithidae), сямейства пеўчых птушак атр. вераб'інападобных. 4—7 родаў, 19—25 відаў. Пашыраны ў Паўд.-Усх. Азіі, 1 від у Еўропе і стэпавай зоне Азіі. Большасць відаў аселыя, з сезоннымі вандроўкамі. Жывуць у лясах, садах, зарасніках па берагах вадаёмаў. Найб. вядомыя: даўгахвостая сініца, або апалоўнік (Aegithalos caudatus), вусатая сініца (Panurus biarmicus). Трапляюцца на Беларусі і суторы (роды Suthora і Paradoxornis). 1 від і 1 падвід у Чырв. кнізе МСАП.

Даўж. цела 11—19 см, маса 8—17 г. Апярэнне мяккае, пушыстае, рыхлае, густое. Хвост доўгі (да палавіны даўж. цела), ступеньчаты. Крылы кароткія, закругленыя. Дзюба кароткая, канічная, успушаная. Нясуць да 14 яец. Кормяцца беспазваночнымі, пераважна насякомымі і павукамі, дробным насеннем.

ТАЎСТАЛО́БІКІ, т а ў с т а л о б ы (Nyophthalmichthynae), падсямейства прэснаводных рыб сям. карпавых. 2 роды, 2 (3) віды Т.: белы, або звычайны, ці талпыга (Hypophthalmichthys molitrix) і стракаты, або вялікагалоў, ці паўднёвы (Aristichthys nobilis). Пашыраны ў рэках Усх. і Паўд.-Усх. Азіі, бас. Амура. Акліматызаваны ў Сярэдняй Азіі, на Пд Усх. Еўропы. На Беларусь завезены ў сярэдзіне 1960-х г. для сажалкавых гаспадарак, з 1970 заселены ў некат. азёры.

Даўж. да 1 м і больш, маса да 35 кг (Т. стракаты). Цела высокае, укрытае дробнай луской. Лоб шырокі, пукаты. Вочы размешчаны нізка. Спінны плаўнік кароткі, без калючых промняў. Маляўкі кормяцца зоапланктонам, дарослыя — фітапланктонам (белы Т.) або мяшаным кормам (стракаты Т.). Аб'екты промыслу і развядзення. Меліяратары вадаёмаў.

ТАЎСТАНО́ГАЎ Георгій Аляксандравіч (28.9.1913, Тбілісі — 23.5.1989), расійскі рэжысёр, тэарэтык тэатра, педагог. Нар. арт. СССР (1957). Д-р мастацтвазнаўства (1968). Герой Сац. Працы (1983). Скончыў Дзярж. ін-т тэатр. мастацтва ў Маскве (1938). Працаваў у Тбілісі рэжысёрам рус. драм. т-ра, выкладаў у тэатр. ін-це (з 1939). З 1946 у Маскве: маст. кіраўнік гастрольнага рэаліст. т-ра, рэжысёр Цэнтр. дзіцячага т-ра. З 1949 гал. рэжысёр Ленінградскага т-ра імя



Таўрычаскі палац.



Таўсталобікі: 1 — белы; 2 — стракаты.

Ленінскага камсамола, з 1956 — Ленінградскага Вял. драм. т-ра (з 1992 яго імя), з 1957 выкладаў у Ленінградскім ін-це т-ра, музыкі і кінематаграфіі (з 1960 праф.). Яго пастаноўкі вызначаліся вял. эмац. і драм. напружаннем, дынамічнасцю, глыбінёй і смеласцю псіхал. рашэнняў, пільнай увагай да духоўнага жыцця персанажа і адначасова яркай тэатральнасцю, эпічным размахам. Сярод пастановак: «Гібель эскадры» А.Карнейчука (1952, 1960), «Аптымістычная трагедыя» У.Вішнеўскага (1955, 1981), «Безыменная зорка» М.Себасцьяна (1956), «Ліса і вінаград» Г.Фігейрэду (1957, 1967), «Пяць вечароў» (1959) і «Мая старэйшая сястра» (1961) А.Валодзіна, «Боская камедыя» І.Штока (1962), «Ціхі Дон» паводле М.Шолахава (1977), «Радавыя» А.Дударава (1985), «Тэатр часоў Нерона і Сенекі» Э.Радзінскага (1986). У пастаноўках класікі гістарызм спалучаў з сучаснай трактоўкай твора, верагоднасць з умоўнасцю: «Ідыёт» паводле Ф.Дастаеўскага (1957, 2-я рэд. 1966), «Тры сястры» (1965) і «Дзядзька Ваня» (1982) А.Чэхава, «Варвары» (1959), «Дачнікі» (1976) і «На дне» (1987) М.Горкага, «Гісторыя каня» паводле «Халстамера» Л.Талстога (1975, з М.Разоўскім), «Ваўкі і авечкі» (1980) і «На ўсякага мудраца хапае прастаты» (1985) А.Астроўскага і інш. Тэарэт. працы па праблемах тэатра і культуры. Дзярж. прэміі СССР 1950, 1952, 1968, 1978. Ленінская прэмія 1958. Дзярж. прэмія Расіі 1986.

Тв.: Современность в современном театре. Л., 1962; О профессии режиссера. М., 1965; Круг мыслей. Л.; М., 1972; Классика и современность. М., 1975; Зеркало сцены. Т. 1—2. 2 изд. Л., 1984.

Літ.: Г.А.Товстоногов: Жизнь и творчество: Библиогр. указ. СПб., 1998. *Л.В.Календа.*

ТАЎСТАРО́Г, млекакормячая жывёла атр. парнакапытных, гл. *Снежны баран.*

ТАЎСТУ́ХА, павуціннік ядомы (Cortinarius esculentus), шапкавы базідыяльны грыб сям. павуціннікавых. Пашырана ў Еўропе, у т.л. на Беларусі. Трапляецца з вер. па кастр. у сухіх хваёвых лясах.

Пладовае цела — шапка на ножцы. Шапка дыяметрам 5—12 см, падушкападобна-пукатая, з загорнутым уніз краем, сухая, светла-бурая. Пласцінкі прырослыя. Мякаць мясістая, белая, шчыльная, з салодкім смакам і прыемным пахам. Ножка выш. 2—5 см, булавападобная, шчыльная, суцэльная, з рэшткамі павуціністага пакрывала. Споры эліпсоідныя, бародаўчатыя, жоўта-бурыя. Ядомая.

ТАЎТА́ВІЧУС (Tautavičius) Адольфас (9.9.1925, в. Курэняй Цельшайскага пав., Літва), літоўскі археолаг. Д-р гіст. н. (1997). Скончыў Вільнюскі ун-т (1950). З 1946 у Ін-це гісторыі АН Літвы (у 1962—87 заг. аддзела археалогіі), адначасова ў 1951—60 выкладаў у Вільнюскім ун-це. З 1988 заг. аддзела археалогіі Цэнтра даследавання «Замкі Літвы». Даследуе культуру насельніцтва Літвы жал. веку і сярэдніх вякоў, гісторыю Вільнюса, нумізматыку Літвы. Праводзіў раскопкі Ніжняга замка ў Вільнюсе, замкаў у Тракаі, Клайпедзе, Велюоне, грунтавых і курганных могільнікаў. Аўтар кн.: «Кафля Вільнюскіх замкаў (XVI—XVII стст.)» (1969), «Археалагічны атлас Літоўскай ССР. Т. 3. Курганы і грунтавыя могільнікі I—XIII ст.» (1977), «Сярэдні жалезны век Літвы (V—IX ст.)» (1996); сааўтар кніг «Нарыс археалогіі Літвы» (1961), «Гісторыя горада Вільнюса» (т. 1, 1968), «Замкі Літвы» (1971), «Гандлёвыя сувязі насельніцтва Літвы ў I—XIII ст.» (1972), «Гісторыя Літоўскай ССР» (1978), «Этнагенез літоўцаў» (1987), «Палац Вільнюскага Ніжняга замка» (т. 1—4, 1989—99). Складальнік кн. «Бібліяграфія археалогіі Літвы» (2000), дзе ўлічаны публікацыі 1782—1999. *В.С.Пазднякоў.*



Кета-енольная **таўтамерыя** для ацэтавоцатнага эфіру: а — кетонная форма (этылавы эфір ацэтавоцатнай кіслаты), б — енольная форма (этылавы эфір β-аксікратонавай кіслаты).

ТАЎТАГРА́МА (ад грэч. tauto тое самае + ... *грама*), верш, усе словы якога пачынаюцца з адной і той жа літары. Т. — своеасаблівая вершаваная забава, гульня. Значнае пашырэнне мела ў даўняй еўрап. паэзіі. У бел. вершатворчасці Т. не прыжылася. Часам сустракаецца ў гукаперайм альных вершах для дзяцей (Р.Барадулін, А.Вольскі і інш.), вершаваных пародыях. Прыклад фалькл. дзіцячага верша-Т.:

Стары Сымон сказаў сынам:
— Сыны, скасіце сена.
Сена скасілі,
Савоську скармілі.

В.П.Рагойша.

ТАЎТАЛАГІ́ЧНАЯ РЫ́ФМА, паўтор у канцы вершаваных радкоў аднаго і таго ж ці некалькіх слоў, якія вызначаюць страфічную будову верша. Сустракаецца ў фальклоры і ў сучаснай паэзіі:

Слепіць вочы ён, **снег**,
І дарогі разбег.
І ты мружышся: «**Снег**!..
Што за студзеньскі **снег**!..»

(А.Лойка. «Снег»)

Разнавіднасць Т.р. ва ўсх. паэзіі — *рэдыф.* *В.П.Рагойша.*

ТАЎТАЛО́ГІЯ (ад грэч. tauto тое самае + *...логія*), 1) спалучэнне або паўтор тых жа самых або блізкіх па сэнсе слоў («масла масленае», «цалкам і поўнасцю»). 2) Відавочны круг у вызначэнні, доказе і інш. (лац. idem per idem — тое самае праз тое самае).

ТАЎТАМЕРЫ́Я (ад грэч. tauto тое самае + meros доля, частка), з'ява раўнаважнага існавання 2 ці больш структурных ізамераў (таўтамераў), якія лёгка ператвараюцца адзін у адзін; асобны выпадак структурнай *ізамерыі*. Рэчывы, схільныя да Т., ва ўмовах усталяванай раўнавагі маюць адначасова малекулы ўсіх таўтамераў у пэўных суадносінах.

Працэс узаемаператварэння таўтамераў наз. таўтамерызацыяй. Таўтамеразацыя адбываецца пераважна за кошт міграцыі катыёнаў (катыёнатропная Т.), радзей — аніёнаў (аніёнатропная Т.). Найб. пашырана прататропная трыядная Т. — міграцыя пратона (H^+) паміж крайнімі атамамі трыяды (сістэма 3 атамаў, з якіх 2 атамы злучаны падвойнай сувяззю), што адбываецца адначасова з перамяшчэннем падвойнай сувязі. Да такога віду адносіцца, напр., кета-енольная Т., якая найб. вывучана для *ацэтавоцатнага эфіру*, у якім прыблізна 7% малекул енольнай формы (гл. *Спірты*). У асобных выпадках таўтамеры могуць быць вылучаны ў індывід. стане, аднак з цягам часу кожны з іх у выніку Т. зноў ператвараецца ў раўнаважную сумесь. Т. — адна з прычын дваістай рэакцыйнай здольнасці арган. злучэнняў. Звычайна існаванне таўтамераў у рэчыве выяўляюць спектральнымі метадамі. Выкарыстоўваюць у сінтэзе некаторых лек. сродкаў і фарбавальнікаў. *Я.Г.Міляшкевіч.*



Таўстуха.

ТАЎЦІВІ́Л (?—1264), адзін з літоўскіх князёў, князь полацкі. Пляменнік *Міндоўга*, верагодна, сын яго старэйшага брата Даўспрунка. Каля 1249 Міндоўг накіраваў Т. і яго брата Эдзівіла ў паход на Смаленскае княства, а сам захапіў іх вотчыны і арганізаваў няўдалую спробу іх забойства. Т. уцёк у Галіцка-Валынскае княства, а потым у Рыгу, дзе прыняў хрышчэнне ў каталіцтва. Паліт. праціўнікі Міндоўга — галіцка-валынскі кн. *Данііла Раманавіч*, Лівонскі ордэн, рыжскі арцыбіскуп і князь Жамойці Выкінт (дзядзька Т. па маці) — падтрымалі Т. як прэтэндэнта на пасад вял. князя ВКЛ і аказалі яму ўзбр. дапамогу. Аднак нанесці Міндоўгу ваеннае паражэнне не ўдалося. Пасля хрышчэння Міндоўга ў каталіцтва ў 1253 накіраваная супраць яго кааліцыя на чале з Т. распалася. Пэўны час Т. заставаўся ў Галіцка-Валынскім княстве і ў 1253 удзельнічаў у паходзе Данілы Галіцкага ў Чэхію. Пазней ён, верагодна, прымірыўся з Міндоўгам. Магчыма, ужо ў 1258 Т. быў полацкім князем і ўдзельнічаў у сумесным паходзе палачан і літоўцаў на Смаленскую зямлю і Таржок, але яго імя ў сувязі з гэтымі падзеямі не згадваецца. У час татарскага паходу на Літву зімой 1258—59 дзейнічаў разам з сынам Міндоўга *Войшалкам* супраць Данілы Раманавіча, саюзніка татар. У 1262 Т. згадваецца як князь полацкі. Верагодна, ён быў адным з арганізатараў забойства Міндоўга ў 1263. Неўзабаве паміж Т. і пераемнікам Міндоўга *Транятам* пачалася барацьба за ўладу, у выніку якой Т. быў забіты. *В.Л.Насевіч.*

ТА́ЎЭР, Т о ў э р (англ. tower вежа), замак-крэпасць у Лондане, на беразе Тэмзы. Найстараж. частка Т., т. зв. Белая вежа, узведзена пры Вільгельме I Заваёўніку (каля 1078—85). Да 17 ст. быў адной з каралеўскіх рэзідэнцый. Да 1820 тут знаходзілася гал. дзярж. турма, у якой былі тайна забіты ці пакараны смерцю шматлікія высокапастаўленыя дзярж. дзеячы Англіі, у т.л. Генрых VI, Эдуард V з братам Рычардам, жонкі Генрыха VIII Ганна Болейн і Кацярына Хоўард, Т.Мор. З 1820 Т. — арсенал, які функцыянуе як музей (зброя, даспехі, каралеўскія рэліквіі).

Самая стараж. ч. Т. — прамавугольная Белая вежа (Уайт-Таўэр; каля 1078—85, выш. 28 м, будаўнік Гундульф з Бека) з капэлай Сент-Джон. На тэр. Т. — раманская царква Сент-Барталам'ю-зе-Грэйт (засн. ў 1123; гатычная «капэла Божай Маці», каля 1330). У стылі неаготыкі Таўэрскі мост (1886—94, арх. Дж.Бэры, Х.Джонс).



Белая вежа (Уайт-Таўэр) у ансамблі **Таўэра**.

ТА́ЎЭРН ВЫСО́КІ (Hohe Tauern), хрыбет ва Усх. Альпах, у Аўстрыі. Даўж. каля 100 км. Выш. да 3797 м (г. Гросглокнер). Складзены пераважна з гнейсаў і гранітаў. Альпійскі рэльеф, ледавікі. Хвойныя лясы, вышэй 1800—2000 м — лугі. Запаведнікі.



Тафільдыя чашачкавая.



Замак-крэпасць **Таўэр**.

ТАФАНО́МІЯ (ад грэч. taphos магіла, пахаванне + nomos закон), раздзел *палеанталогіі*, які даследуе заканамернасці, умовы намнажэння і пахавання жывёл і раслін, утварэнне месцазнаходжанняў іх выкапнёвых рэшткаў. Асн. палажэнні Т. распрацаваў І.А.*Яфрэмаў* у 1940—57. Т. вывучае стадыі працэсу: утварэнне пасмяротных скопішчаў арганізмаў (*танатацэноз*), перанос і перапахаванне, пераход іх у паўвыкапнёвы стан (тафацэноз), *акамянеласці* (фасіліі), змены і ператварэнні тафацэнозу пад уздзеяннем *гіпергенезу* ў сукупнасць іх акамянелых рэшткаў (*арыктацэноз*). Т. мае значэнне для рэканструкцыі *палеабіяцэнозаў*, *біяцэнозаў* і *экасістэм* мінулых геал. часоў, умоў існавання арганізмаў і працэсаў асадкаўтварэння. Гл. таксама *Біястратыграфія*.

ТАФІ́ЛЬДЫЯ (Tofieldia), род кветкавых раслін сям. лілейных. Каля 20 відаў. Пашыраны пераважна ва ўмеранай зоне Еўразіі і Паўн. Амерыкі. На Беларусі 1 від — Т. чашачкавая (T. calyculata), занесеная ў Чырв. кнігу. Трапляецца ў хмызняках, на нізінных лугах, мохавых балотах.

Шматгадовыя травяністыя карэнішчавыя расліны выш. 20—40 см. Сцёблы прамастойныя, з 1—3 паменшанымі лісцікамі. Прыкаранёвае лісце ў разетцы, вузкалінейнае, мечападобнае. Кветкі дробныя, жаўтавата-белыя, сабраныя ў густую верхавінкавую гронку. Плод — каробачка. *А.М.Скуратовіч.*

ТАФПЯНЕ́Ц Рыма Лазараўна (н. 19.1.1928, г. Барысаў Мінскай вобл.), бел. вучоны ў галіне матэрыялазнаўства. Д-р тэхн. н. (1981), праф. (1983). Скончыла БПІ (1950). З 1954 у Фізіка-тэхн. ін-це АН Беларусі (адначасова ў БПІ). З 1992 у Бел. нац. тэхн. ун-це. Навук. працы па тэарэт. асновах фарміравання структуры і ўласцівасцей метал. матэрыялаў, сінергетыцы працэсаў структураўтварэння, распрацоўцы тэхналогій тэрмічнай і тэрмацыклічнай апрацоўкі сплаваў для паляпшэння іх уласцівасцей.

Тв.: Структурные факторы эксплуатационной стойкости режущего инструмента. Мн., 1984 (разам з С.Я.Бельскім); Физические основы термоциклической обработки стареющих сплавов. Мн., 1992 (у сааўт.).

ТАФРАГЕНЕ́З (ад грэч. taphros роў, яма + ... *генез*), працэс утварэння буйных *грабенаў* ва ўмовах расцяжэння зямной кары. Адбываецца на заключнай стадыі развіцця складкавых горных збудаванняў (тафрагенная стадыя). Тэрмін прапанаваны ням. геолагам Э.Крэнкелем у 1924. Абазначае таксама працэс утварэння глыбокіх упадзін з патончанай кансалідаванай зямной карой і магутным асадкавым чахлом. Гл. таксама *Рыфт*.

ТАФРЫНА́ЛЬНЫЯ (Taphrinales), парадак сумчатых грыбоў. 1 сям., 1 род, каля 100 відаў. Пашыраны пераважна ва ўмераных зонах. На Беларусі каля 10 відаў. Найб. вядомыя віды з роду тафрына: слівавая (Taphrina pruni) — узбуджальнік «кішэнек» слівы, малая

(T.minor) — выклікае кучаравасць лісця ў вішні, бярозавая (T. betulina) — утварае «ведзьміны мётлы» на бярозе.

Пладовыя целы адсутнічаюць. Міцэлій грыбоў эндафітны, распаўсюджваецца па міжклетніках і клетках у тканках раслін-гаспадароў. У многіх відаў захоўваецца зімой у трэшчынах кары, сцёблах і пупышках хворых раслін. Сумкі цыліндрычныя, булавападобныя ці падоўжаныя. Слой сумак звычайна мае жоўтае, чырв., ружовае або фіялетавае адценне, што надае незвычайную афарбоўку заражанаму органу. Споры акруглыя ці яйцападобныя, здольныя да пачкавання. Высокаспецыялізаваныя паразіты дзікарослых дрэў і пладовых культур.

ТАФТ (Taft) Уільям Хоўард (15.9.1857, г. Цынцынаты, ЗША — 8.3.1930), дзяржаўны дзеяч ЗША. Юрыст. Бацька сенатара Р.А.Тафта, аднаго з ініцыятараў *Тафта-Хартлі закона* (1947). Вучыўся ў Ельскім каледжы (1874—78) і юрыд. школе ў Цынцынаты (1878—80). Быў адвакатам, суддзёй, з 1901 губернатар Філіпінаў, з 1904 ваен. міністр ва ўрадзе Т.*Рузвельта*. У 1909—13 прэзідэнт ЗША (27-ы) ад Рэсп. партыі. Выступаў за абмежаванне эканам. дыктату вял. трэстаў, за пашырэнне амер. ўплыву ў Кітаі і Цэнтр Амерыцы («Дыпламатыя долара»). З 1913 праф. права ў Ельскім ун-це, з кастр. 1921 старшыня Вярх. суда ЗША.

Літ.: Американские президенты: 41 ист. портрет от Джорджа Вашингтона до Билла Клинтона: Пер. с нем. Ростов н/Д; М., 1997.

ТА́ФТА—ХА́РТЛІ ЗАКО́Н (Taft-Hartley Act, афіц. назва Labor-Management Relations Act), федэральны акт, прыняты 23.6.1947 Кангрэсам ЗША, аб рэгуляванні прац. адносін у краіне. Назва ад імя сенатара Р.А.Тафта і чл. Палаты прадстаўнікоў Ф.Хартлі, якія ўзначальвалі працу па падрыхтоўцы гэтага закона. Быў скіраваны супраць папярэдняга ліберальнага і незбалансаванага (абмяжоўвала толькі інтарэсы наймальнікаў) прац. заканадаўства «новага курсу» (закон Вагнера ад 5.7.1935). Закон абмяжоўваў правы наёмных работнікаў і прафсаюзаў: забарона прафсаюзам уносіць у калект. дагавор пункт пра «закрыты цэх», забарона забастовак дзярж. служачых; уведамленне прадпрымальніка рабочымі пра іх стачку за 30 дзён да яе пачатку; наданне заканад. сходам штатаў права забараняць прафс. гарантыі, дазволеныя федэральным заканадаўствам; рэгулярныя справаздачы прафсаюзаў міністру працы пра ўсе свае справы; пісьмовыя паказанні пад прысягай аб непрыналежнасці прафс. функцыянераў да Камуніст. партыі ЗША і інш. У 1959 дадаткова прыняты закон Лэндграма—Грыфіна, а ў 1970 і дапаўненні да яго, якія прадугледжвалі далейшае рэгуляванне прац. адносін у ЗША.

ТА́ХА, Тэжу (ісп. Tajo, партуг. Tejo), рака ў Іспаніі і Партугаліі, самая вялікая на Пірэнейскім п-ве. Даўж. 1010 км, пл. бас. 81 тыс. км^2. Вытокі ў гарах Універсалес, перасякае з У на З пласкагор'е Месета, у ніжнім цячэнні — Партугальскую нізіну. Упадае ў Атлантычны ак., утварае эстуарый даўж. каля 45 км. Мнагаводная ад ліст. да сакавіка. Сярэдні расход вады каля мяжы Іспаніі з Партугаліяй 438 м^3/с. ГЭС, вадасховішчы. Выкарыстоўваецца для арашэння. Суднаходная на 185 км да г. Абрантыш, для марскіх суднаў да г. Сантарэн. На Т. — гарады Таледа (Іспанія), Сантарэн (Партугалія), у эстуарыі — сталіца Партугаліі Лісабон.

ТАХАГЕНЕРА́ТАР (ад грэч. tachos хуткасць, скорасць + *генератар*), электрамашынны генератар, прызначаны для вымярэння частаты вярчэння або вугловага паскарэння валоў машын і механізмаў, жорстка звязаных з ротарам Т., па значэнні яго эрс або частаты апошняй. Адрозніваюць Т. пераменнага току (асінхронныя з полым ротарам і сінхронныя) і пастаяннага току (з незалежным узбуджэннем або з пастаяннымі магнітамі).

ТАХА́РЫ, 1) народ, які ў 140—129 да н.э. з'явіўся ў Сярэдняй Азіі і знішчыў *Грэка-Бактрыйскае царства*. Адна з груп Т. у канцы 1 ст. да н.э. — пач. 1 ст. н.э. стварыла *Кушанскую дзяржаву*. Т. размаўлялі на мове іранскай групы, якая захоўвалася да канца 1-га тыс. н.э. 2) Умоўная назва носьбітаў т. зв. тахарскіх моў, якія жылі ў старажытнасці ў Сярэдняй Азіі і Усх. Туркестане і да канца 1-га тыс. н.э. асіміляваны цюркамі.

ТАХАРЫСТА́Н, назва гіст. вобласці, якая ахоплівала Паўд. Узбекістан і Таджыкістан і Пн Афганістана; ужывалася ў 5—13 ст. Паходзіць ад назвы народа *тахараў*.

ТАХЕАМЕТРЫ́ЧНАЯ ЗДЫ́МКА, від *тапаграфічнай здымкі* мясцовасці *тахеометрам*. Пры Т.з. вымяраюць гарыз. і верт. вуглы, адлегласць і перавышэнне здымачнага пункта (пікета) адносна здымачнай станцыі. Планава-вышынным абгрунтаваннем Т.з. з'яўляюцца пункты дзярж. геад. сеткі, тахеаметрычныя і інш. хады. Паводле даных Т.з. складаюць *тапаграфічныя карты* (маштаб 1:500 — 1:5000) і планы мясцовасці з адлюстраваннем рэльефу гарызанталямі. Выкарыстоўваецца пры праектаванні дарог, трубаправодаў, каналаў, у буд-ве, геолагаразведачных работах і інш.

П.П.Явід.

ТАХЕО́МЕТР [ад грэч. tachys (tacheos) хуткі + *...метр*], геадэзічная прылада для вымярэння на мясцовасці гарыз. і верт. вуглоў, адлегласцей і перавышэнняў пры *тахеаметрычнай здымцы*. Бывае электронны, намаграмны, дыферэнцыяльны і ўнутрыбазавы. Электронны Т. уключае святлодальнамер і вылічальны блок, што дазваляе атрымліваць неабходныя велічыні і запісваць іх на носьбіты інфармацыі для складання тапаграфічнага плана, лічбавай мадэлі мясцовасці.

П.П.Явід.

ТАХІЁНЫ (ад грэч. tachys хуткі), гіпатэтычныя часціцы, што рухаюцца са скорасцю, большай за скорасць святла ў вакууме. Эксперыментальна не выяўлены. Іх існаванне не супярэчыць *адноснасці тэорыі*, аднак вядзе да цяжкасцей з пункту гледжання *прычыннасці прынцыпу*. Ад гэтых цяжкасцей пазбаўляюцца дапушчэннем, што Т. ўзнікаюць у працэсах узаемадзеяння як *віртуальныя часціцы* і ў свабодным стане не назіраюцца.

ТАХІКАРДЫ́Я (ад грэч. tachys хуткі + kardia сэрца), павелічэнне частаты сардэчных скарачэнняў больш як 90 за 1 мін у спакоі (у нованароджаных норма 120—140). Адрозніваюць фізіял. (ад перанапружання ў час фіз. працы, ад спякоты і інш.) і паталаг. Т. (захворванні сэрца, інш. органаў, ліхаманка, анемія), пастаянную і прыступападобную. Пры выражанай Т. адзначаецца слабасць, галавакружэнне, боль у вобласці сэрца. Лячэнне тэрапеўт., хірург. і інш.

І.М.Семяненя.



Тахеометр.

ТАХІ́НЫ, вожыка-мухі, мухі-скаралёткі (Tachinidae), сямейства круглашыўных караткавусых насякомых атр. двухкрылых. Больш за 5 тыс. відаў. Пашыраны ўсюды. Жывуць сярод раслінаснасці, на кветках, лісці. На Беларусі найб. трапляюцца стурмія скутэлята (Sturmia scutellata), Т.-хрушчаедка (Microphthalma disjuncta), Т. вялікая (Tachina grossa), Т. рыжая (T. fera), фазія залацістая (Clytiomyia helluo) і інш.

Даўж. да 20 мм. Цела ўкрыта шорсткімі доўгімі шчацінкамі (адсюль другая назва). Дарослыя кормяцца нектарам кветак, выдзяленнямі тлей і чарвяцоў; лічынкі большасці Т. — паразіты вусеняў матылёў, клапоў, лічынак жукоў, некат. дажджавых чарвей і дробных пазваночных. Акукліваюцца ў глебе ці ў целе гаспадара. Некат. віды Т. выкарыстоўваюць у якасці біял. сродку барацьбы са шкоднымі беспазваночнымі. *С.Л.Максімава.*

ТАХІРЫ́ДАЎ ДЗЯРЖА́ВА, іранскае дзярж. ўтварэнне ў 9 ст. Узнікла ў пач. 9 ст. ў працэсе распаду *Абасідаў халіфата*. Заснавальнік Т.дз. — Тахір ібн Хусейн [821—828], намеснік *Абасідаў* у *Харасане* (на тэр. сучасных Ірана, Туркменістана і Афганістана). Яго сыны Тальха [822—828] і Абдалах [828—844], які ўсталяваў сталіцу ў г. Нішапур, зрабілі Т.дз. фактычна незалежнай пры фармальным вяршэнстве Абасідаў. У Т.дз. пачаўся працэс складання новай, мусульм. перс. культуры. У 873 Т.дз. заваявана эміратам Сафарыдаў.

ТАХІТЭ́ЛІЯ (ад грэч. tachys хуткі + telos вынік, мэта), адносна паскораны тэмп *эвалюцыі*. Тэрмін увёў амер. палеантолаг Дж. Г.Сімпсан (1944). Характэрна для філагенет. развіцця некат. груп арганізмаў. Напр., фарміраванне новага сям. ў класе млекакормячых праходзіла за дзесяткі мільёнаў гадоў, некат. групы (грызуны, капытныя) фарміраваліся за некалькі мільёнаў гадоў. Асн. фактары ўзнікнення Т. — рэзкія і частыя змены ўмоў існавання. Пазней Т. змяняецца *брадытэліяй* (запаволеным тэмпам эвалюцыі), гаратэліяй (сярэднім тэмпам эвалюцыі) ці выміраннем.



Тахіны: 1 — вялікая; 2 — феракс; 3 — карцэлія бамбіланс; 4 — блефарыпода скутэлята.

ТАХО́МЕТР (ад грэч. tachos хуткасць, скорасць + ... *метр*), прылада для вымярэння частаты вярчэння (вуглавой скорасці) дэталей (пераважна валоў) машын і механізмаў. Адрозніваюць Т. магнітныя, вібрацыйныя, інтэгруючыя (гадзіннікавыя і электронныя), магнітна-індукцыйныя, магнітаэл., страбаскапічныя, частотна-імпульсныя, ферадынамічныя, электронна-лічыльныя (лічбавыя), мех., гідраўлічныя, пнеўматычныя і інш. Межы вымярэнняў ад 0 да 1 млн. аб/мін.

У магнітна-індукцыйных Т. адхіленне стрэлкі прапарцыянальнае рознасці вярчальных момантаў на восі ротара і спружыны. На гэтым прынцыпе працуюць авіяц. Т., аўтамаб. спідометры і інш. Сярод механічных найб. пашыраны цэнтрабежны Т., заснаваны на змене становішча рухомых мас (ураўнаважаных спружынай) пры вярчэнні. Перамяшчэнні іх прапарцыянальныя скорасці вярчэння. У гідраўлічных Т. змена становішча паказчыка залежыць ад ціску вадкасці, які зменьваецца прапарцыянальна скорасці вярчэння. Т. з аўтам. запісам паказанняў наз. тахографам.

ТАХТАДЖА́Н Армен Леонавіч (н. 10.6.1910, г. Шуша, Нагорны Карабах, Азербайджан), армянскі і расійскі батанік. Акад. АН Арменіі (1971). Акад. Рас. АН (1972, чл.-кар. 1966). Чл. Нац. АН ЗША (1971), Фінскай акадэміі навук і славеснасці (1971), Герой Сац. Працы (1990). Скончыў Усесаюзны ін-т субтрапічных культур у Тбілісі (1932). З 1938 у Ерэванскім ун-це (заг. кафедры), з 1944 дырэктар Бат. ін-та АН Арменіі, у 1954—86 у Бат. ін-це Рас. АН (заг. аддзела, дырэктар). Навук. працы па сістэматыцы, філагеніі, эвалюц. марфалогіі вышэйшых раслін, тэорыі эвалюцыі; стваральнік новай філагенет. сістэмы раслін і батаніка-геагр. раянавання Зямлі. Дзярж. прэмія СССР 1981.

Тв.: Основы эволюционной морфологии покрытосеменных. М.; Л., 1964; Происхождение и расселение цветковых растений. Л., 1970; Флористические области земли. Л., 1978; Система магнолиофитов. Л., 1987.

В.Ф.Ермакоў.

ТАХТАМЫ́Ш (?—1406), хан *Залатой Арды*. Нашчадак хана *Джучы*. У 1370-я г. пры дапамозе *Цімура* заваяваў раёны Паўд. Казахстана і ў бас. р. Сырдар'я. У 1380, выкарыстаўшы паражэнне ў Кулікоўскай бітве *Мамая*, які не належаў да дынастыі Джучы, Т. захапіў уладу ў Залатой Ардзе. У першыя гады свайго кіравання аднавіў адзінства дзяржавы пасля шматгадовай смуты. У 1382 захапіў і спаліў Маскву. У 1389—95 вёў вайну з Цімурам, якая скончылася паражэннем Т. і ўцёкамі ў ВКЛ. У 1395—98 жыў у г. Ліда. У 1397 і 1398 разам з Вітаўтам удзельнічаў у паходах на Дон і Крым, адкуль прывёў шмат татарскіх сем'яў, якія пасяліліся ў ВКЛ (Беларусь, Літва, Украіна). У 1398—99 пацярпеў паражэнне ад хана Заволжскай Арды Цімур-Кутлука. Забіты ў Сібіры ханам Шадыбекам.

І.Б.Канапацкі.



А.Л.**Тахтаджан**.



В.М.**Тацішчаў**.

ТАХУМУ́ЛЬКА (Tajumulco), дзеючы вулкан у Вулканічнай Сьеры, у Гватэмале. Мае форму правільнага конуса з 2 вяршынямі. Выш. да 4217 м (найвышэйшая вяршыня Цэнтр. Амерыкі). Складзены з андэзітаў. Апошняе вывяржэнне ў 1863. На схілах хваёвыя лясы, дубровы, горныя лугі.

ТАЦІ́ШЧАЎ Васіль Мікітавіч (29.4.1686, каля г. Пскоў, Расія — 26.7.1750), расійскі дзярж. дзеяч, гісторык. Род Т. паходзіў ад смаленскіх князёў. Удзельнік *Паўночнай вайны 1700—21*, у т.л. баявых аперацый 1705—06 на тэр. ВКЛ і Польшчы, *Палтаўскай бітвы 1709*. Выконваючы ваен.-дыпламат. даручэнні *Пятра I* за мяжой, Т. узбагаціў свае веды ў галінах філасофіі і гісторыі, геаграфіі і горнай справы, эканам. і паліт. вучэнняў, што пазней дазваляла яму грунтоўна асвятляць адпаведныя пытанні ў сваіх творах і запісках. У 1720—22 і 1734—37 кіраўнік казённых заводаў на Урале, заснаваў г. *Екацярынбург* (1721); 1741—45 астраханскі губернатар. Аўтар прац па гісторыі, геаграфіі, філасофіі, эканоміцы (пры яго жыцці амаль не друкаваліся). На падставе шматлікіх летапісаў і інш. крыніц стварыў абагульняльную працу «Гісторыя Расійская з самых старажытнейшых часоў» (кн. 1—5, 1768—1848), дзе ўпершыню ў рас. гістарыяграфіі зрабіў спробу знайсці заканамернасці ў гіст. развіцці Расіі; гіст. прагрэс звязваў з развіццём асветы. Сярод выкарыстаных Т. крыніц былі летапісы, якія не дайшлі да нашага часу, у т.л. адзін са спісаў *Полацкага летапісу*. Па яго творах удакладняюцца многія падзеі з гісторыі Беларусі: месца бітвы кн. Уладзіміра Святаславіча з Яраполкам (на р. Друць), прычыны нападу Уладзіміра Святаславіча на Полацк у 980 (на-



Схемы **тахометраў**: а — механічнага цэнтрабежнага (1 — вал, 2 — слізгальная муфта, 3 — рычаг, 4 — груз, 5 — спружына); б — магнітна-індукцыйнага з дыскавым ротарам (1 — пастаянны магніт, 2 — медны або алюмініевы ротар, 3 — вось ротара са стрэлкай, 4 — спружына).

пад полацкага кн. Рагвалода на ўладанні Ноўгарада), уладкаванне спраў полацкіх князёў з Уладзімірам Усеваладавічам Манамахам у 1121, час заснавання Навагрудка (1044), Барысава (1102), акалічнасці ўзнікнення ВКЛ (вакол *Навагрудскага княства*), помсты *Войшалка* забойцам яго бацькі *Міндоўга* і інш. Т. упершыню даследаваў паходжанне тэрміна *Белая Русь*, які лічыў указаннем на прыгажосць і багацце гэтай зямлі і адносіў яго ўзнікненне да 12 ст. Даследаваў узнікненне герба ВКЛ *«Пагоня»*, які лічыў запазычаным у стараж.-рус. княстваў. Т. паклаў пачатак этнаграфіі і крыніцазнаўства ў Расіі, упершыню апублікаваў *Рускую праўду, Судзебнік 1550*. Аўтар першага рас. энцыкл. слоўніка — «Лексікон расійскі гістарычны, геаграфічны, палітычны і грамадскі» (ч. 1—3, 1793, да літары «К»). Да праблем эканам. развіцця Расіі Т. падыходзіў з пазіцый развітога *меркантылізму*, адводзячы дзяржаве вырашальную ролю ў кіраўніцтве эканам. жыццём краіны. У працах па эканоміцы абгрунтоўваў тэорыю «гандл. балансу» і значную ролю купецтва ў павелічэнні даходаў дзяржавы. Адным з першых выказаў меркаванні аб неабходнасці банкаў, у т.л. для крэдытавання прам-сці і гандлю.

Тв.: Собр. соч. Т. 1—8. М., 1994—96; Записки. Письма, 1717—1750 гг. М., 1990.

Літ.: Юхт А.И. Государственная деятельность В.Н.Татищева в 20-х — начале 30-х гг. XVIII в. М., 1985; Шакинко И.М. В.Н.Татищев. М., 1987; Кузьмин А.Г. Татищев. 2 изд. М., 1987; Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т. 1. Мн., 2000; Штыхаў Г.В. Дзевяць стагоддзяў Барысава. Мн., 2002.

Г.В.Штыхаў, Р.Ч.Лянькевіч.

«ТАЦЦЯ́НКА», бел. нар. танец. Муз. памер 2/4. Тэмп умераны, пераходзіць у жвавы. Выконваецца парамі і адной дзяўчынай — Таццянкай. Хлопцы па чарзе спяваюць куплеты аднайм. песні і танцуюць перад дзяўчынай, якая дэманструе абыякавасць да іх, потым выбірае аднаго з хлопцаў, былая партнёрка якога становіцца чарговай Таццянкай. Зафіксаваны ў канцы 19 ст. ў Дзісненскім павеце. *І.М.Хвораст.*

ТА́ЦЫТ Публій Карнелій (Publius Cornelius Tacitus; каля 58, г. Інтэрамн, цяпер г. Тэрні, Італія — пасля 117), старажытнарымскі гісторык і паліт. дзеяч. Займаў пасады прэтара (88), консула (97), праконсула правінцыі Азія (112—113). Аўтар прац: «Гісторыя» (з 14 кн. захаваліся 1—4 і часткова 5, нап. каля 105—107) ахоплівае жыццё Рыма і ўсёй імперыі 69—96; «Аналы» (з 16 кн. захаваліся 1—4, 11—15, нап. каля 115—117) асвятляюць гісторыю Рым. імперыі 14—68. У этнагр. і геагр. нарысе «Германія» (98) апісаў грамадскі лад, рэлігію і побыт стараж. германцаў. Гал. рухаючай сілай гісторыі лічыў волю і ўчынкі людзей, найперш імператараў, ідэалізаваў арыстакратычную рэспубліку. Звесткі Т. вызначаюцца дакладнасцю і ўяўляюць каштоўнасць як сведчанні відавочцы.

Тв.: Рус. пер. — Соч. Т. 1—2. М., 1993; Анналы. Малые произведения. История. М., 2001.

Літ.: Кнабе Г.С. Корнелий Тацит: Время. Жизнь. Книги. М., 1981; Немировский А.И. Рождение Клио: У истоков ист. мысли. Воронеж, 1986. *А.Г.Зельскі.*

ТАЧА́НКА, рысорная конная павозка з адкрытым лёгкім кузавам для парнай запрэжкі. Т. з узмоцненай запрэжкай (тройкай або чацвёркай коней) у час грамадз. вайны ў Расіі (1918—20) выкарыстоўваліся ў кавалерыі ў якасці рухомай баявой пляцоўкі пад станковы кулямёт. Баявы разлік кулямётнай Т. складаўся з 2—3 чал. — наводчыка, памочніка і ездавога. У Вял. Айч. вайну выкарыстоўваліся бел. партызанамі.

ТАЧЫ́ЛЬШЧЫКІ (Anobiidae), сямейства жукоў падатр. разнаедных. Каля 1,7 тыс. відаў. Пашыраны на ўсіх мацерыках, акрамя Антарктыды. Жывуць у мёртвай драўніне, дрэвавых грыбах, радзей у сцёблах жывых раслін. Некат. віды пашкоджваюць драўляныя збудаванні, мэблю, кнігі, харч. прадукты. Найб. трапляюцца Т.: дамавы (Anobium pertinax), звычайны (A. punctatum), хлебны (Stegobium paniceum) і інш. На Беларусі 31 від.



1 2

Тачыльшчыкі: 1 — хлебны; 2 — дамавы.

Даўж. да 8 мм. Цела цыліндрычнае, зверху ўкрыта валаскамі. Афарбоўка ад жоўта-рыжай да чорна-бурай. Вусікі 8—11-члянікавыя, піла-, грэбене- ці булавападобныя. Лапкі 5-члянікавыя. Лічынкі белыя, мясістыя, С-падобныя, з кароткімі нагамі. Кормяцца адмерлай драўнінай. *С.Л.Максімава.*

ТАЧЫ́ЦКІ Эдуард Іванавіч (н. 19.7.1935, Мінск), бел. вучоны ў галіне матэрыялазнаўства і тэхналогіі мікраэлектронных вырабаў. Чл.-кар. Нац. АН Беларусі (1994), д-р тэхн. н. (1974), праф. (1981). Скончыў БДУ (1959). З 1959 у Фізіка-тэхн. ін-це, з 1976 заг. лабараторыі Ін-та электронікі, з 1990 дырэктар Інж. цэнтра «Плазматэг» Нац. АН Беларусі. Навук. працы па структуры, кінетыцы і тэрмадынаміцы фазавых пераўтварэнняў у тонкіх плёнках і пакрыццях, праблемах павышэння надзейнасці і даўгавечнасці машын нанясеннем зносаўстойлівых і ўмацавальных пакрыццяў. Распрацаваў тэорыю кінетыкі ўзнікнення і росту тонкіх плёнак ва ўмовах стацыянарнага і імпульснага асаджэння. Стварыў імпульсныя катодна-дугавыя крыніцы плазмы для нанясення высокадакладных шматслойных і шматкампанентных пакрыццяў і сінтэзу новых матэрыялаў. Сфармуляваў прынцыпы рэалізацыі метастабільных фазавых і структурных станаў у тонкіх плёнках. Эксперыментальна атрымаў алмазныя і алмазападобныя плёнкі пры нізкіх т-рах.

Тв.: Производство полуфабрикатов из спеченной алюминиевой пудры (САП). М., 1965 (у сааўт.); Структура тонких металлических пленок. Мн., 1968 (разам з В.П.Севярдэнкам); Кристаллизация и термообработка тонких пленок. Мн., 1976. *М.П.Савік.*



Э.І.**Тачыцкі**.

ТАЧЭ́ННЕ, такарная апрацоўка, адна з асноўных аперацый апрацоўкі матэрыялаў *рэзаннем*. Выконваецца звычайна на *такарных станках* пры вярчальным руху загатоўкі (выробу) і паступальным руху разца. Т. апрацоўваюцца вонкавыя і ўнутр. паверхні цел вярчэння (цыліндрычныя, канічныя або фасонныя), а таксама спіральныя і вінтавыя паверхні дэталей складанай формы.

ТАШКЕ́НТ, горад, сталіца Узбекістана, цэнтр аднайм. вобласці. Знаходзіцца ў перадгор'ях Зах. Цянь-Шаня, у даліне р. Чырчык. 2148 тыс. ж. (2000). Вузел чыгунак і аўтадарог. Міжнар. аэрапорт. Гал. прамысл. і культ. цэнтр рэспублікі. Прам-сць: машынабудаванне, у т.л. с.-г., тэкст., авіяц., эл.-тэхн., трансп., інструментальнае, электроннае і інш.; металаапр., баваўняная, трыкат., абутковая, швейная, хім., нафтахім., хіміка-фармацэўтычная, харчасмакавая, харч., буд. матэрыялаў, шкляная, фарфора-фаянсавая і інш. Метрапалітэн. АН Узбекістана, Ун-т. 12 тэатраў. Музеі: мастацтва Узбекістана, гісторыі народаў Узбекістана, л-ры імя А.Наваі. Цэнтр турызму.

Упершыню ўпамінаецца ў кіт. хроніках канца 2 — пач. 1 ст. да н.э. пад назвай Юні. У 4—5 ст. н.э. гар. паселішча Чач (Шаш) у цэнтры земляробчага аазіса, на перакрыжаванні гандл. шляхоў паміж Усходам і Еўропай. У 6 ст. ў складзе Цюркскага каганата. У 8—9 ст. пад назвай Бінкент быў цэнтрам самаст. ўладання Чач (Шаш). У пач. 8 ст. завяваны арабамі. Шмат разоў разбураўся качэўнікамі. У 9—10 ст. у складзе дзяржавы Саманідаў, у канцы 10 — пач. 13 ст. — дзяржаў Караханідаў і Каракітаяў. Упершыню пад назвай Т. упамінаецца ў 11 ст. У пач. 13 ст. Т. захапіў шах Харэзма Мухамед II, паводле загаду якога ў 1214 горад разбураны, а жыхары пераселены. У 14 ст. завяваны Цімурам і

ператвораны ў адну з найбуйнейшых крэпасцей дзяржавы Цімурыдаў. У 2-й пал. 16 ст. далучаны да *Бухарскага ханства*, у 17—18 ст. захоплены казахамі і калмыкамі. У 1809 у складзе Какандскага ханства. У 1865 далучаны да Расіі, з 1867 цэнтр Туркестанскага ген.-губернатарства і Сырдар'інскай вобл. У 1899 да Т. пракладзена сяроднеазіяцкая чыгунка, у 1906 чыгункай злучаны з Арэнбургам. З 1918 сталіца *Туркестанскай Аўтаномнай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі*, з 1930 — Узбекістана. У час Вял. Айч. вайны ў Т. была эвакуіравана АН БССР, жыў Я.Колас. Т. — месца сустрэч прадстаўнікоў краін Азіі і Афрыкі. Тут падпісана *Ташкенцкая дэкларацыя 1966*. З 1993 у Т. дзейнічае бел. культ. цэнтр «Світанак».

У 5—8 ст. на тэр. Т. існавалі ўмацаваныя паселішчы (гарадзішчы Мінг-Урук, Кугайт-Тэпе), раннефеад. сядзібы і замкі (Ак-Тэпе, 6—8 ст., дабудовы 11 ст.). У Старым горадзе з 1—2-глінакаркаснымі дамамі вылучаюцца партальна-купальныя маўзалеі Шэйхантаўр (15 ст.), Кафаль Шашы, медрэсэ Барак-хана і Кукельташа (16 ст.). У пач. 20 ст. побач вырас рэгулярна распланаваны, абводнены арыкамі і азеленены Новы горад. У 1930-я і 1950-я г. Т. кардынальна перапланаваны, пабудаваны буйныя жылыя масівы, грамадскія будынкі, у т.л. т-р оперы і балета (1940—47, арх. А.Шчусеў, размалёўкі маст. Ч.Ахмарава, разьба па дрэве нар. майстроў Т.Арсланкулава, К.Джалілава, братоў Джураевых і інш.). Пасля землетрасення 1966 Т. адбудаваны і развіваецца паводле генплана 1970.

Літ.: Древний Ташкент. Ташкент, 1973; Кадырова Т.Ф. Архитектура центра Ташкента. Ташкент, 1976; Глясс Ю.И. Музеи Ташкента: Спр.-путеводитель. Ташкент, 1983.

ТАШЛЫКО́Ў Ігар Серафімавіч (н. 4.6.1946, Канка, КНДР), бел. фізік. Д-р фіз.-матэм. н. (1989), праф. (1991). Чл. Нью-Йоркскай АН (1994). Скончыў БДУ (1969). З 1969 у БДУ, з 1972 у НДІ прыкладных фіз. праблем БДУ. З 1989 у Бел. тэхнал. ун-це. Навук. працы па фіз. працэсах узаемадзеяння паскораных іонаў з цвёрдымі целамі. Выявіў механізмы пашкоджанняў і трансфармацыі структуры цвёрдых цел пры іонных працэсах апрамянення і нанясення тонкіх пакрыццяў на вырабы мікраэлектронікі. Прапанаваў метады павышэння мех. і каразійнай трываласці, каталітычнай актыўнасці, адгезійнай устойлівасці, ліяфільнасці матэрыялаў.

Тв.: Неразрушающий анализ поверхностей твердых тел ионными пучками. Мн., 1987 (разам з Ф.Ф.Камаровым, М.А.Кумахавым); Ионное перемешивание бикомпонентных слоев на основе никеля // Физика и химия обработки материалов. 1991. № 1.

Я.Г.Міляшкевіч.

«ТАШЫ́БА», «Тасіба» (англ. Toshiba), адна з буйнейшых кампаній па электроніцы ў Японіі. Утворана ў 1939, сучасная назва з 1978. Вырабляе цяжкія эл. машыны, быт. эл. абсталяванне, сродкі камунікацыі і аўдыя-, відэа- і камп'ютэрную тэхніку. Мае 30 філіялаў у Японіі, сумесныя прадпрыемствы ў многіх краінах свету.



Ташкент. Медрэсэ Кукельташа.



Ташкент. Будынак тэатра.



Панарама **Ташкента**.

ТАШЫ́ЗМ (ад франц. tache пляма), інфармальнае мастацтва, плынь у заходнееўрапейскім *абстракцыянізме* 1950—60-х г. Ташысты ствараліі карціны метадам «псіхічнай імправізацыі» (мазкі фарбы накладваліся на палатно хуткімі рухамі рукі без папярэдне абдуманага плана). Т. блізкі да амер. абстрактнага экспрэсіянізму, але адрозніваўся менш кідкай манерай узаемадзеяння плямы з палатном, большай лёгкасцю формы, увагай да колеру. Некат. карціны, выкананыя ў гэтай манеры, асацыіруюцца з прыроднымі з'явамі: воднымі стыхіямі, горнымі ландшафтамі, рухамі атмасферы, аб'ектамі мікрасвету, адлюстраванымі на фотаздымках. Сярод найб. значных прадстаўнікоў Т.: Ж.Мацьё, Г.Гартунг, П.Сулаж, Ж.Базен (Францыя), Э.Ведова (Італія), А.Іорн (Данія).

ТАЭКВАНДО́, тэквандо, тхэквандо [англ. tack wondo ад кар. таэ (тэ) — літар. — удар нагой + кван — удар рукой + до — шлях], від спарт. барацьбы, адзін з відаў усх. адзінаборстваў. Сутнасць паядынку — адбіць атаку праціўніка пры дапамозе рук і ног; мэта — нанесці саперніку найб. колькасць заліковых удараў. Паядынак

адбываецца на пляцоўцы 12 × 12 м, складаецца з 3 раундаў па 3 мін. Спартсмены падзяляюцца на 8 вагавых катэгорый.

Як від адзінаборстваў узнік у Карэі каля 2 тыс. г. назад, як від спорту склаўся ў 1950-х г.: тэрмін «Т.» з'явіўся ў 1955. Сусв. федэрацыя Т. засн. ў 1973, аб'ядноўвае 47 краін (2002). Чэмпіянаты свету праводзяцца з 1973; жанчыны ўдзельнічаюць з 1987. Найб. развіта ў краінах Еўропы, Паўд.-Усх. Азіі, Паўн. Амерыкі.

На Беларусі секцыі Т. з'явіліся ў пач. 1980-х г. Федэрацыя Т. краіны прынята ў еўрап. федэрацыю ў 2000. Нац. зборная каманда Беларусі на XV чэмпіянаце свету (2002, Карэя) заняла 8-е агульнакаманднае месца; мужчынская каманда — бронз. прызёр IX чэмпіянату Еўропы (2000). Сярод бел. спартсменаў найб. вызначыліся прызёры чэмпіянатаў свету: М.Жураўская і А.Чарняўская (2001, 2002); Еўропы: М.Зыгмантовіч, І.Рамашкевіч (1994), Ю Сухавіцкая (1998), А.Макараў, В.Міхельсон, К.Шуша (2000) і інш.

ТАЮА́НЬ, горад на Пн Кітая, на р. Фыньхэ (бас. Хуанхэ). Адзін з найстараж. гарадоў Кітая. Адм. ц. прав. Шаньсі. Больш за 2 млн. ж: (2001). Трансп. вузел і буйны прамысл. цэнтр. Прам-сць: чорная металургія, цяжкае машынабудаванне, хім., ваен., лёгкая. Арх. помнікі: храмавы комплекс Цзіньцы (першыя будынкі — 6 ст., да 17 ст. пабудавана больш за 300 храмаў, павільёнаў, залаў, альтанак, мастоў); у цэнтры — драўляны храм Шэнмудзянь (1023—31). Паблізу Т. — пячорны храм на гары Цяньлуншань (засн. ў 6 ст.). У наваколлі Т. здабыча кам. вугалю, жал. руды, вапнякоў.

ТАЯ́КІНА Таццяна Аляксееўна (н. 12.1.1951, Кіеў), украінская артыстка балета. Нар. арт. СССР (1980). Скончыла Кіеўскае харэагр. вучылішча (1969). З 1967 ва Украінскім т-ры оперы і балета імя Т.Шаўчэнкі. Яе танец адметны віртуознасцю, класічнай чысцінёй ліній. Выканаўца вядучых партый класічнага і сучаснага рэпертуару: Адэта — Адылія, Аўрора («Лебядзінае возера», «Спячая прыгажуня» П.Чайкоўскага), Кітры («Дон Кіхот» Л.Мінкуса), Жызэль («Жызэль» А.Адана), Маўка («Лясная песня» М.Скарульскага) і інш. Дзярж. прэмія Украіны імя Шаўчэнкі 1986.

І.Л.Чэбан.

ТАЯ́МА, горад у Японіі, на З цэнтр. часткі в-ва Хонсю. Адм. ц. аднайм. прэфектуры. Каля 350 тыс. ж. (2001). Вузел чыгунак і аўтадарог. Порт на Японскім моры. Аэрапорт. Прам-сць: каляровая і чорная металургія, нафтахім., маш.-буд., тэкст., фармацэўтычная, цэлюлозна-папяровая, суднабудаўнічая. Ун-т.

ТБІЛІ́СІ, горад, сталіца Грузіі. Знаходзіцца ў Тбіліскай катлавіне, на р. Кура. 1310 тыс. ж. (2000). Вузел чыгунак і аўтадарог. Міжнар. аэрапорт. Прам-сць: маш.-буд., у т.л. электравозабуд., авіяц., станкабуд., с.-г., ліцейнага абсталявання, эл.-тэхн. сродкаў сувязі і інш.; тэкст., гарбарна-абутковая, харчасмакавая, хім., дрэваапр., шкляная, фарфорафаянсавая, фармацэўтычная, паліграфічная. Метрапалітэн, пасаж.-канатныя дарогі, у т.л. фунікулёр. АН Грузіі. Ун-т. 14 тэатраў. Музеі: Дзяржаўны, мастацтва Грузіі, карціннай галерэя Грузіі, нар. і прыкладнога мастацтва. Бат. сад. На ПдУ — Тбіліскі бальнеалагічны курорт.

У 4-м тыс. да н.э. на месцы Т. было паселішча, у 4 ст. н.э. — горад-крэпасць. Пры цару *Вахтангу I* Гаргасале Т. — буйны эканам. цэнтр Усх. Грузіі. Яго сын Дачы завяршыў будаўніцтва гар. сцен (пач. 6 ст.) і зрабіў Т. сталіцай *Картлі* (замест Мцхеты). Пасля зававання Усх. Грузіі арабамі (сярэдзіна 7 ст.) Т. — рэзідэнцыя араб. эміра. На працягу 7—11 ст. горад часта разбуралі хазары і арабы. Вызвалены ў 1122 царом *Давідам Будаўніком*, стаў сталіцай аб'яднанай груз. дзяржавы. У 13—18 ст. горад спусташалі харэзмійцы,



Цэнтральная частка **Тбілісі**.



Тбілісі. Стары горад.



Панарама **Тбілісі**.

манголы, войскі Цімура, арабы, туркі. З пач. 19 ст. да 1935 наз. Тыфліс. У 1801 Т. ў складзе Усх. Грузіі далучаны да Рас. імперыі, стаў цэнтрам Груз., з 1846 — Тыфліскай губ., у 1844—82 — Каўказскага намесніцтва. У 1872 злучаны чыгункай з г. Поці, у 1883 — з Баку і Батумі. У 1917—18 тут дзейнічаў *Закаўказскі камісарыят*, які ў 1918 склікаў *Закаўказскі сейм*. З 1921 Т. — сталіца Грузіі, адначасова ў 1922—36 сталіца *Закаўказскай Федэрацыі*. У 1927—30(?) у горадзе існавала Бел. студэнцкае земляцтва пры Тыфліскім дзярж. політэхн. ін-це.

Стараж. ядро Т. — Стары горад з вузкімі вуліцамі, якія захавалі рысы сярэдневяковай забудовы, з 2—3-павярховымі цаглянымі дамамі (пераважна 1830—40-я г.), аздобленымі разнымі драўлянымі крытымі балконамі. Сярод помнікаў: руіны цытадэлі Нарыкала (4 ст., 16—17 ст.), цэрквы Анчысхаты (6 ст., 17 ст.), Метэхі (1278—93), кафедральны сабор Сіёні (6—7 ст., перабудаваўся), лазні цара Растома (17 ст.). З 19 ст. разрастаўся т. зв. Новы горад (цэнтр сучаснага Т.) з прамавугольнай сеткай вуліц, будынкамі ў стылях позняга класіцызму, эклектыкі, мадэрна, з выкарыстаннем нац. форм. З пач. 20 ст. Т. забудоўваўся паводле генпланаў. Добраўпарадкаваны і рэканструяваны старыя, створаны новыя магістралі і плошчы, масты, набярэжныя. Забудаваны новыя гар. кварталы (Аўчала, Сабуртала, Дыгомі, Глдані і інш.). Сярод найб. значных збудаванняў: Музей мастацтваў (б. гасцініца Зубалашвілі; 1835), ун-т (б. дваранская гімназія; 1906, арх. С.Клдыяшвілі), б-ка (б. Груз. дваранскі зямельны банк; 1912—16, арх. А.Кальгін), стадыён «Дынама» (1933—37, арх. А.Курдыяні, рэканструяваны), Палац спорту (1961, арх. У.Алексі-Месхішвілі, Ю.Касрадзе, канструктар Д.Каджаія), канцэртная зала філармоніі (1971, арх. І.Чхенкелі, канструктар Ш.Газашвілі), Дом урачыстых падзей (1984, арх. В.Джарбенадзе і інш.). З 1966 вядзецца буд-ва метрапалітэна. Помнікі: манумент «300 арагвінскіх герояў» (1961), статуя «Маці-Грузія» (1963), Ніко Пірасманашвілі (1975) і інш.

Літ.: Квирквелия Т. Архитектура Тбилиси. Тбилиси, 1982.

ТБІЛІ́СКІ ЭМІРА́Т, мусульманскае феад. ўладанне на тэр. Грузіі ў 8 — пач. 12 ст. Узнік у выніку *арабскіх завяванняў* у 730-я г. як частка *Амеядаў халіфата* (з 750 *Абасідаў халіфата*), кіраваўся эмірамі (князямі) з рэзідэнцыяй у г. *Тбілісі*. Спачатку Т.э. падпарадкоўвалася ўся Усх. Грузія, але ў выніку вызв. барацьбы грузін яго тэр. скарачалася. У 9 ст. пад уладай эміраў заставалася толькі тэр. *Картлі*, у 11 ст. — Тбілісі з прылеглым раёнам. З канца 9 да канца 11 ст. Т.э. быў фактычна незалежны ад араб. халіфаў. У 1122 войскі груз. цара *Давіда Будаўніка* авалодалі Тбілісі, які стаў сталіцай аб'яднанай Грузіі. Т.э. спыніў існаванне.

ТВАРАНО́ВІЧ Галіна Паўлаўна (н. 17.2.1955, в. Дараганава Асіповіцкага р-на Магілёўскай вобл.), бел. літаратуразнавец, крытык, паэтэса. Д-р філал. н. (1999). Скончыла БДУ (1977). У 1977—80 у выд-ве «Навука і тэхніка», з 1983 у Ін-це л-ры Нац. АН Беларусі. З 1999 выкладае ва Ун-це ў Беластоку. З 2001 гал. рэдактар час. «Studia wschodniosłowiańskie» («Даследаванні ўсходнеславянскія»). Друкуецца з 1967, як літ.-знавец з 1982. Даследаванні па ўзаемасувязях сучаснай бел. прозы і прозы б. Югаславіі, кампаратывістыцы, гісторыі бел. л-ры, сучасным літ. працэсе: «Маральны свет героя: Беларуская і югаслаўская ваенная проза 60—70-х гг.» (1986), «Пакутаю здабыты мір: Тыпалогія характару ў беларускай і славенскай прозе» (1991) і інш. Адзін з аўтараў «Гісторыі беларускай літаратуры XX ст.» (Т. 1—4, 1999—2002). У паэт. зб-ках «Ускраек тысячагоддзя» (1996), «Верасы Дараганава» (2000) філас. роздум над праблемамі жыцця, лёсам чалавека ў Вечнасці, любоў да роднай зямлі, хрысц. матывы. Перакладае з сербскай і польскай моў.

Тв.: Беларуская літаратура: Паўднёваславянскі кантэкст: (Адзінства генезісу, тыпаў літаратур і характар узаемасувязей). Мн., 1996. *А.В.Спрынчан.*

ТВАРДО́ЎСКІ Аляксандр Трыфанавіч (21.6.1910, б. хутар Загор'е, Пачынкаўскі р-н Смаленскай вобл., Расія — 18.12.1971), рускі паэт і грамадскі дзеяч. Скончыў Маскоўскі ін-т філасофіі, л-ры і гісторыі (1939). У час вызвалення Зах. Беларусі ў 1939, сав.-фінляндскай 1939—40 і Вял. Айч. войнаў ваен. карэспандэнт. У 1950—54, 1958—70 гал. рэдактар час. «Новый мир». Друкаваўся з 1924. У даваен. зб-ках «Сельская хроніка» (1939), «Загор'е» (1941) тэмы перабудовы вёскі. У паэме «Краіна Муравія» (1936; Дзярж. прэмія СССР 1941) з вял. маст. сілай адлюстраваў складанасць калектывізацыі і выкліканыя ёю змены ў лёсе і псіхалогіі сялянства. У паэме «Васіль Цёркін: Кніга пра байца» (1942—45; Дзярж. прэмія СССР 1946) створаны вобраз бывалага салдата, у якім увасоблены лепшыя духоўныя і маральныя рысы народа. Чаргаванне трагічных і побытавых малюнкаў, лірычных адступленняў і вясёлага досціпу, трапнасць і выразнасць мовы дазволілі шматгранна выявіць атмасферу нар. вайны, думкі і пачуцці людзей. Лірыка Т. ваен. гадоў перадавала перажыванні народа, захоўваючы канкрэтнасць падзей і абставін, сувязі з уяўленнямі радавога салдата, учарашняга працаўніка; спалучала душэўную пранікнёнасць і публіцыст. страснасць з эпічным размахам. У пасляваен. час паглыбляў і развіваў асн. праблематыку творчасці, працягваў асэнсаванне ваен. выпрабаванняў і нар. подзвігу (паэма «Дом ля дарогі», 1946; Дзярж. прэмія СССР 1947), у сац.-маральным і філас. плане раскрываў гіст. лёс народа, паказваў сучасніка ў складаных калізіях часу. У лірыка-публіцыст. паэме «За даллю — даль» (1953—60; Ленінская прэмія 1961) абагульнены найб. істотныя з'явы ў жыцці краіны, грамадскія настроі 1950-х г. У зб-ках «Вершы з запісной кніжкі» (1961) і «З лірыкі гэтых гадоў, 1959—1967» (1967; Дзярж. прэмія СССР 1971) унутр. свет чалавека, узбагачанага вял. вопытам падзей 20 ст. Аўтар сатыр. паэмы «Цёркін на тым свеце» (1963), ліра-эпічнага цыкла вершаў «Па праву памяці» (1968—69; выд. 1987), нарысаў, апавяданняў і аповесцей («Дзённік старшыні калгаса», 1932; «З Карэльскага перашыйка», нап. 1939—41; «У родных мясцінах», 1946; «Печнікі», 1958; «Нататкі з Ангары», 1959), літ.-крытычных артыкулаў пра творчасць А.Пушкіна, М.Някрасава, І.Буніна, М.Ісакоўскага, А.Куляшова і інш. Творчасці Т. ўласцівы далучанасць да нар. жыцця, прастата і яснасць стылю, сувязь з фальклорам і класічнай традыцыяй. Высока цаніў бел. л-ру, удзельнічаў у рабоце многіх з'ездаў пісьменнікаў Беларусі. Беларусі прысвяціў вершы «Слова пра зямлю», «Запрашэнне гасцей»,



А.Т.**Твардоўскі**.



М.**Твэн**.

«Мінская шаша» і інш., нарысы ў кн. «Радзіма і чужына» (1947). Перакладаў на рус. мову бел. нар. песні, творы Я.Купалы, Я.Коласа, Куляшова, М.Засіма, М.Сурначова і інш., рэдагаваў «Анталогію беларускай паэзіі» (М., 1952), складальнік зб. «Паэты Заходняй вобласці» (Мн., 1935). На бел. мову творы Т. пераклалі Э.Агняцвет, П.Броўка, А.Бялевіч, М.Калачынскі, К.Крапіва, Куляшоў, М.Лужанін, Р.Няхай, А.Русак, Г.Пашкоў, М.Танк, і інш.; яму прысвечаны паэма Куляшова «Варшаўскі шлях» (1973), верш Ю.Голуба «Аляксандр Твардоўскі ў Гродне», артыкулы Броўкі, В.Быкава, А.Зарыцкага, Куляшова і інш. Сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў СССР (1950—54, 1959—71).

Тв.: Собр. соч. Т. 1—6. М. 1976—83; Бел. пер. — Выбр. творы. Мн., 1953; За даллю — даль. Мн., 1962; Вершы. 1931—1970. Мн., 1989.

Літ.: Македонов А.В. Творческий путь Твардовского. М., 1981; Воспоминания о А.Твардовском. 2 изд. М., 1982; Кондратович А.И. «Ровесник любому поколению»: Док. повесть. М., 1984. *В.Л.Бечык.*

ТВАРЫ́ЧАЎКА, вёска ў Крынічным с/с Мазырскага р-на Гомельскай вобл., каля аўтадарогі Мазыр—Новая Рудня. Цэнтр калгаса. За 9 км на Пд ад горада і 16 км ад чыг. ст. Мазыр, 142 км ад Гомеля. 294 ж., 105 двароў (2002). Клуб, б-ка, аддз. сувязі.

ТВІНДЭ́К (англ. tween-deck ад between паміж + deck палуба), міжпалубная прастора на *судне*. У Т. размяшчаюць грузавыя памяшканні, пасажырскія каюты і інш. На шматпалубных суднах некалькі ярусаў Т., на аднапалубных яны могуць размяшчацца ў падоўжаных надбу-

довах (бак, юта) або паміж гал. палубай і платформамі, што падзяляюць некаторыя *трумы*.

ТВІСТ (ад англ. twist літар. — кручэнне), папулярны бытавы маладзёжны танец, блізкі да *рок-н-рола*. Паявіўся ў 1960-я г. ў ЗША, заснавальнікам лічыцца Х.Бэлард. У 1960—70-я г. распаўсюдзіўся ў многіх краінах свету. Муз. памер 4/4, з акцэнтам на цотных чвэрцях такта. Яго вызначаюць актыўныя маторыка і характэрныя звілістыя рухі корпуса, супрацьлеглыя напрамку руху ступняў.

ТВО́РЧАСЦЬ, духоўна-пераўтваральная дзейнасць людзей у грамадстве, накіраваная на стварэнне новых літ.-маст., рэліг., этычных, прававых, сац.-паліт., навук.-тэхн. і эканам. каштоўнасцей. Паводле якасных крытэрыяў сфера Т. іерархічная, характарызуецца такімі ацэначнымі паняццямі як *здольнасці, талент, геніяльнасць, вынаходніцтва*, пазітыўнае наватарства, адкрыццё. Адрозніваецца ад *вытворчасці* (у вузкім, спецыфічным сэнсе гэтага паняцця), арыентаванай на колькаснае павелічэнне спажывецкіх і духоўных каштоўнасцей па распрацаваных у сферах Т. ўзорах, тыражаванне літ.-маст. твораў і эстэт. адкрыццяў. Наяўнасць творчых магчымасцей у грамадстве — неабходная ўмова стварэння і абнаўлення культ. традыцыі народа, дзяржавы, нацыі. Процілегласць і аўтаномнасць сфер Т. і вытворчасці адносныя, залежаць ад тыпу культуры, узроўню падзелу працы і спецыялізацыі на розных этапах гіст. развіцця грамадства. У сістэме цывілізацый арганічнай культуры (антычнасць, сярэдневяковая і раннефеад. культура, традыц. вяскова-сял. культура) рамесніцкая культура спалучае ў сабе прыкметы творчай унікальнасці і вытв. масавасці (гл. *Народная творчасць*); на элітарным узроўні вылучаецца саслоўе творчай інтэлігенцыі: літаратараў, майстроў усіх відаў прафес. мастацтва, вучоных, тэолагаў, філосафаў, інжынераў. У эпоху індустр.-урбаністычных тыпаў цывілізацыі адбываецца зрошчванне сфер Т. і вытворчасці, навукі і тэхналогіі, элітарнай і масавай культуры, выцясненне традыц. відаў маст. Т. дызайнам і сурагатамі электроннай культуры. Гарантам адраджэння Т. застаецца навук., філас. і маст. традыцыі, самабытная нац. культура. Унікальнасць творчых здольнасцей народа з найб. паўнатой выявілася ў маст. Т. — сферы эстэт. дзейнасці, накіраванай на стварэнне якасна новых духоўных каштоўнасцей, напаўненне традыц. маст. культуры новымі якасцямі і сэнсамі.

У ант. і сярэдневяковым грамадстве маст. Т. не вылучалася з агульнага комплексу стваральнай дзейнасці рамесніцкага тыпу, якая разглядалася як ніжэйшы від творчага працэсу ў параўнанні з філасофіяй і тэалогіяй. Пафасам бязмежных творчых магчымасцей чалавека прасякнута культура эпохі Адраджэння, калі ўзнік культ генія — носьбіта творчай інтэнцыі. Асветніцкая філасофія 17—18 ст. разглядала Т. як новыя камбінацыі існуючых элементаў (эмпірызм Ф.Бэкана, Т.Гобса, Дж.Лока, Д.Юма, матэрыялізм Д.Дзідро, П.Гольбаха, К.Гельвецыя). Завершаную тэорыю Т. як унікальнай дзейнасці заснавалі І.Кант, Ф.Шэлінг. Яна паслужыла эстэт. асновай рамантызму, пазней неарамантызму і элітарных канцэпцый «чыстага» мастацтва. Г.Гегель разглядаў маст. Т. поруч з рэлігіяй і філасофіяй як паступальнае выяўленне абсалютнай ідэі ў форме ідэалу (этапу развіцця духоўнай культуры, абсалютнага духу). У сучаснай філасофіі і культуралогіі дамінуюць 2 канцэпцыі Т.: экзістэнцыяльная (погляд на творчы працэс як экстатычны прарыў асобы з прыроднай неабходнасці і сац. мэтазгоднасці ў сферу свабоды) і прагматычная (Т. як здольнасць камбінацыі і вынаходніцтва).

У гісторыі бел. грамадска-паліт. і філас. думкі, літ.-маст. Т. адлюстраваліся асн. канцэпцыі Т., характэрныя для еўрап. хрысц. цывілізацыі: сярэдневяковая, арыентаваная на хрысц. маральныя імператывы (Ефрасіння Полацкая, Кірыла Тураўскі, Клімент Смаляціч і інш.), рэнесансавая канцэпцыя універсальнай гармоніі паміж асобай і грамадствам, навукай і верай, філасофіяй і тэалогіяй (Ф.Скарына і яго паслядоўнікі), рамант. і нац.-адраджэнскія (19—20 ст.).

Літ.: Дорошевич Э.К., Конон В.М. Очерк истории эстетической мысли Белоруссии. М., 1972; Творческий процесс и художественное восприятие. Л., 1978; Давыдова Г.А. Творчество и диалектика. М., 1976; Бердяев Н.А. Творчество и объективация: [Сб.]. Мн., 2000. *У.М.Конан.*

ТВО́РЧЫ САЮ́З, грамадскае аб'яднанне творчых работнікаў, якія сваімі дасягненнямі зрабілі ўклад у развіццё культуры, мастацтва і інш. культ. творчай дзейнасці. У Рэспубліцы Беларусь ствараецца ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку на аснове агульнасці інтарэсаў яго членаў у пэўным відзе творчай дзейнасці для задавальнення іх духоўных або інш. нематэрыяльных патрэб. Прававымі крыніцамі Т.с. з'яўляюцца Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, Закон «Аб творчых саюзах і творчых работніках» ад 16.12.1999 і інш. заканадаўчыя акты. Членамі (удзельнікамі) Т.с. могуць быць фіз. асобы, якія займаюцца культ. творчай дзейнасцю або прадстаўляюць пэўную творчую прафесію. Умовы і парадак прыёму ў члены Т.с. вызначаюцца статутам Т.с. Ствараюцца і дзейнічаюць Т.с.на прынцыпах добраахвотнасці, незалежнасці, самакіравання і галоснасці, яны незалежныя ў сваёй дзейнасці ад паліт. партый і інш. грамадскіх аб'яднанняў. Дзяржава рэгулюе грамадскія адносіны ў сферы культурнай творчай дзейнасці, садзейнічае стварэнню спрыяльных умоў для забеспячэння і папулярызацыі дзейнасці Т.с., пашырэнню іх міжнар. сувязей. Найб. вядомыя і масавыя бел. Т.с.: *Саюз беларускіх пісьменнікаў, Саюз кампазітараў Беларусі, Саюз мастакоў Беларусі, Саюз тэатральных дзеячаў Беларусі, Саюз журналістаў Беларусі* і інш.

Г.А.Маслыка.

ТВЭН (Twain) Марк [сапр. Клеменс (Clemens) Сэмюэл Ленгхарн; 30.11.1835, Фларыда, штат Місуры, ЗША — 21.4.1910], амерыканскі пісьменнік. Працаваў наборшчыкам у друкарні, рачным лоцманам, шукальнікам золата, рэпарцёрам. Дэбютаваў апавяд. «Знакамітая жабаскакуха з Калавераса» (1865). Уражанні ад падарожжа ў Еўропу і Палесціну ў кн. нарысаў «Прасцякі за мяжой» (1869). Аўтар аўтабіягр. нарысаў «Загартаваныя» (1872), сатыр. рамана «Пазалочанае стагоддзе» (1873, з Ч.Д.Уорнерам), гумарыст. зб. «Старыя і новыя апавяданні» (1875). Найб. вядомасць атрымалі 2 цыклы твораў Т.: своеасаблівы эпас ракі Місісіпі (зб-кі нарысаў «Даўнія часы на Місісіпі», 1875, «Жыццё на Місісіпі», 1883; аповесці «Прыгоды Тома Соера», 1876, «Прыгоды Гекльберы Фіна», 1884) і проза на «сярэдневяковыя» тэмы (алегарычная аповесць «Прынц і жабрак», 1882; раман-антыўтопія «Янкі з Канектыкута пры двары караля Артура», 1889; раман «Асабістыя ўспаміны пра Жанну д'Арк яе пажа і сакратара Луі дэ Конта», 1896, і інш.). Уражанні ад кругасветнага падарожжа ў кн. «Па экватары» (1897). Аўтар аповесцей «Прасцяк Вільсан», «Том Соер за мяжой» (абедзве 1894), «Том Соер—сышчык» (1897), «Чалавек, які спакусіў Гедліберг» (1899), серыі памфлетаў і інш. У творах выкрываў сац.-грамадскія заганы, расізм і калан. палітыку, ілжывасць афіц. маралі, параўноўваў амер. мінуўшчыну з сучаснасцю, Старому свету супрацьпастаўляў Новы як увасабленне амер. цывілізацыі; яны насычаны фалькл. і міфалагічнымі матывамі і вобразамі, прыгодніцкімі сюжэтамі, адметныя багатай палітрай камічнага (сатыра, гратэск, пародыя, гумар), фабульным дынамізмам і інш. Яго творы неаднаразова экранізаваны. Сярод перакладчыкаў твораў Т. на бел. мову І.Гурскі, П.Кавалёў, А.Марціновіч, Я.Маўр, І.Пташнікаў, А.Савіцкі, Б.Сачанка, Я.Семяжон, М.Татур, М.Ткачоў, Т.Хадкевіч і інш. У 1982 Бел. т-р імя Я.Коласа паводле яго аднайм. аповесці паставіў спектакль «Прыгоды Гекльберы Фіна».

Тв.: Бел. пер. — Прыгоды Гекльберы Фіна. Мн., 1937; Прыгоды Тома Соера. 2 выд. Мн., 1939; Утаймаванне веласіпеда: Апавяданні. Мн., 1971; Прынц і жабрак. Мн., 2001; Рус. пер. — Собр. соч. Т. 1—8. М., 1980; Афоризмы и шутки. М., 2000.

Літ.: Боброва М.Н. Марк Твен: Очерк творчества. М., 1962; Марк Твен и его роль в развитии американской реалистической литературы. М., 1987; Марк Твен в воспоминаниях современников. М., 1994; Левидова И. Марк Твен: Библиогр. указ. М., 1974.

Е.А.Лявонава.

Т'ЕРА КАЛЬЕ́НТЭ (ісп. tierra caliente гарачая зямля), ніжні вышынны ландшафтны пояс у гарах Цэнтр. Амерыкі і нізкіх шыротах Паўд. Амерыкі. Размешчаны адпаведна на выш. да 800 м і 1000—1500 м. Пераважаюць пакатыя схілы, перадгорныя ўзгоркі і хрыбты, конусы вынасу. Клімат гарачы, вільготны. Сярэднямесячныя т-ры 22—27 °С. На наветраных схілах ападкаў больш за 2000 мм за год, расліннасць — горная гілея; на падветраных схілах ападкаў да 500 мм за год і меней, лістападна-веч-

назялёныя лясы, ксерафітныя рэдкалессі і хмызнякі. Плантацыі какавы, бананаў, цукр. трыснягу, у засушлівых раёнах — кава, тытунь, бавоўнік.

Т'ЕРА ТЭМПЛА́ДА (ісп. tierra templada умераная зямля), сярэдні вышынны ландшафтны пояс у гарах Цэнтр. Амерыкі і нізкіх шырот Паўд. Амерыкі. Размешчаны адпаведна на выш. 800—1700 м і 1000—2800 м. Характэрны стромкія схілы, вузкія цясніны. Клімат умерана цёплы. Сярэднямесячныя т-ры 17—24 °С. Значныя сутачныя ваганні т-р. На наветраных схілах ападкаў больш за 3000 мм за год, вечназялёныя лясы з папараццю, бамбукам, эпіфітамі; на падветраных схілах — лістападна-вечназялёныя лясы. У Т.т. асн. маса насельніцтва Калумбіі, Венесуэлы, Эквадора. Плантацыі кавы, кукурузы.

Т'ЕРА ФРЫ́Я (ісп. tierra fria халодная зямля), верхні вышынны ландшафтны пояс у гарах Цэнтр. Амерыкі і нізкіх шырот Паўд. Амерыкі. Размешчаны адпаведна на выш. 1700—3000 м і 2200—3500 м. Пераважаюць стромкія схілы. Клімат умерана халодны. Сярэднямесячныя т-ры 11—18 °С. Ападкаў 700—800 мм на падветраных схілах, 1500—2000 мм за год на наветраных схілах. Вільготныя высакагорныя мяшаныя лясы з папараццю, бамбукам, эпіфітамі. З выш. 3000 м — нефелагілея. Т.ф. — гал. раён вырошчвання зернебабовых культур і бульбы; лугавыя пашы.

ТКАНІ́НА ТЭКСТЫ́ЛЬНАЯ, выраб, атрыманы ў працэсе *ткацтва* перапляценнем нітак — падоўжных (*аснова*) і папярочных (*уток*); найб. пашыраны выраб *тэкстыльнай прамысловасці*.

Вырабляецца на *ткацкіх станках*. Знятая з ткацкага станка тканіна, наз. суравізнай. Яна становіцца гатовай для выкарыстання пасля *адбельвання, фарбавання*, спец. прамочвання (напр., *апрэтавання, мерсерызацыі*) і інш. відаў апрацоўкі. Таўшчыня Т.т. — 0,1—5 мм, шырыня — 0,4—1,5 м (тканіны шырынёй да 0,4 м наз. стужкамі). Т.т. падзяляюць на аднародныя (з аднаго віду валокнаў — *баваўняная тканіна, ільняная тканіна, шарсцяная тканіна, шаўковая тканіна*), мяшаныя (з нітак, атрыманых з некалькіх відаў валокнаў), неаднародныя (з розных нітак). Вырабляюць тканіны з гладкай паверхняй і з ворсам (гл. *Ворсавая тканіна*), стракатыя (з рознакаляровых нітак) і меланжавыя (гл. ў арт. *Меланж*), гладкафарбаваныя (афарбаваныя ў адзін колер) і набіўныя (з друкаваным узорам на добрым баку; гл. *Друкаванне тканін*), адна- і многаслойныя. Выкарыстоўваюць у быце (Т.т. бытавога прызначэння — бялізнавыя, адзежныя, дэкаратыўныя і інш.) і тэхніцы (гл. *Тэхнічная тканіна*).

ТКАНІ́НЫ МАСТА́ЦКІЯ, ткацкія вырабы ручной ці машыннай вытворчасці, якія вызначаюцца мастацкасцю арнаментацыі, прыгажосцю расфарбоўкі, высокім майстэрствам выканання: від *дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва*. Вырабляюць з шарсцяных, ільняных, баваўняных, шаўковых, сінт., штучных нітак, арнаментуюць перапляценнем іх



Да арт. **Тканіны мастацкія**. Копцкая габеленавая тканіна. 4 ст.

у працэсе *ткацтва*, набіваннем малюнка (гл. *Набіванка*), *вышыўкай, батыкам, аплікацыяй* і інш. Прызначаюцца для вырабу адзення, аздаблення мэблі, інтэр'ераў і інш. Характар маст. афармлення Т.м. абумоўліваецца іх прызначэннем, матэрыялам, тэхн. магчымасцямі выканання, адлюстроўвае стылістычныя асаблівасці розных эпох у развіцці мастацтва, этнічныя, нац., сац. адметнасці і інш. Вядомы амаль усім народам з глыбокай старажытнасці. Высокай мастацкасцю з 2-га тыс. да н.э. славіліся кіт. і яп. (пераважна шаўковыя), інд. баваўняныя з набіўным узорам, іранскія і тур. шарсцяныя і шаўковыя тканіны, вырабы народаў Сярэдняй Азіі і Заказаўказзя, *габелены, карункі*, тканіны Італіі, Францыі і інш.

На Беларусі Т.м. вядомы з 11—13 ст., калі ва ўжытак увайшоў гарызантальны *ткацкі станок* з нітамі і панажамі — *кросны* і пашырылася вышыўка. Высокім узроўнем вызначалася прадукцыя рамесных ткацкіх цэхаў 15—17 ст. У 18 ст. на прадпрыемствах мануфактурнага тыпу ў Карэлічах, Міры, Камянцы, Нясвіжы, Альбе, Гродне, Слоніме ткалі *шпалеры* сюжэтна-тэматычнага характару (гл. *Карэліцкія шпалеры*), ворсавыя дываны, узорыстыя кілімы, шаўковыя паясы, тканіны для абіўкі сцен і інш.



Да арт. **Тканіны мастацкія**. Шпалера «Паляванне на аленя». Германія. Канец 15 — пач. 16 ст.



Да арт. **Тканіны мастацкія**. Арнат з г. Косава Іванцэвіцкага раёна Брэсцкай вобл. Фрагмент. 18 ст.



Да арт. **Тканіны мастацкія**. Аксаміт. Францыя. 1868.

(гл. *Нясвіжскія паясы, Гродзенскія каралеўскія мануфактуры, Гродзенскія паясы*). Шырокую вядомасць набылі шаўковыя *слуцкія паясы* і інш. вырабы (галуны, пазументы, стужкі) Слуцкай мануфактуры шаўковых паясоў. Шклоўская мануфактура славілася арнаментаванымі тканымі шпалерамі, паясамі і тканінамі з залатым шыццём; у фальварку

Сямёнаўка каля Шклова залатымі, сярэбранымі і шаўковымі ніткамі вышывалі жаночае і мужчынскае адзенне. Многія Т.м. вызначаліся спалучэннем усх., заходнееўрап. і мясц. традыцый і матываў. У 19 ст. цэхавая і мануфактурная вытв-сць Т.м. саступіла месца прамысл. машыннай. З канца 19 ст. з паляпшэннем інтэр'ера традыц. жылля, пашырэннем новых ткацкіх тэхнік Т.м. пашырыліся і ў нар. побыце. Традыц. палатняная, браная, выбарная, саржавая тэхнікі ткацтва, што здаўна ўжываліся для вырабу *адзення, ручнікоў, абрусаў*, дапоўніліся пераборнай, шматнітавой і інш. тэхнікамі, якія ўзбагацілі колеравы і арнаментальны дыяпазон вырабаў. Паласаты ці клятчасты дэкор палатнянага або рыпсавага перапляцення, ромбагеам. арнамент браных і выбарных тканін чырвона-белага каларыту узбагаціўся новымі матывамі (стылізаванымі расл., арнітаморфнымі, зааморфнымі і інш.), каларыстыкай вырабаў. Пашырыліся Т.м. інтэр'ернага прызначэння (*посцілкі, дываны*, ручнікі, *сурвэткі*, фіранкі і інш.), выкананыя разнастайнымі відамі перабору з прыціскной асновай, дэкар. відамі ажурнага ткацтва, вышыўкай крыжыкам, палі-хромнай адвольнай *гладдзю* і інш. У 1-й пал. 20 ст. вытв-сць традыц. нар. Т.м. скараціласа, пераважалі вырабы фабрычнай тэкстыльнай вытв-сці, малюнкі для якіх стваралі спецыялісты-мастакі. Традыцыі нар. ўзорыстага ткацтва ў 1930—50-я г. прадоўжылі маст. арцелі (выраблялі тканыя і вышываныя абрусы, ручнікі, хусткі, сурвэткі, шторы, блузкі, сукенкі, мужчынскія сарочкі і інш.), з 1960-х г. — ф-кі маст. вырабаў, у асартыменце якіх посцілкі, дываны, накідкі на крэслы, абрусы, сурвэткі, ручнікі, адзенне і інш., выкананыя і аздобленыя ў традыцыях нар. Т.м. Акрамя традыц. тэхнік ткацтва і аздаблення выкарыстоўваюцца і новыя: ручная размалёўка, машынная вышыўка, аэраграфія, батык і інш. Разнастайнасцю арнаментыкі, сакавітасцю і яркасцю малюнка вызначаюцца посцілкі, дываны, ручнікі работы нар. майстроў. З 1960-х г. адрадзіўся бел. габелен. Створаныя паводле кардонаў вядомых мастакоў габелены і габелены-заслоны сюжэтна-тэматычнага і арнаментальна-дэкар. характару аздабляюць інтэр'еры грамадскіх і адм. будынкаў. У наш час Т.м. падарункавага, сувенірнага, маст. характару, для аздаблення грамадскіх будынкаў, сцэн. касцюмаў для самадзейных і прафес. калектываў і інш. ствараюць нар. майстры, мастакі-тэкстыльшчыкі, прадпрыемствы маст. прам-сці (гл. *Мастацкіх вырабаў вытворчасць*), прамысловыя Т.м. — на тэкстыльных ф-ках, камбінатах і аб'яднаннях.

Літ.: Соболев Н.Н. Очерки по истории украшения тканей. М.; Л., 1934; Руденко С.И. Древнейшие в мире художественные ковры и ткани... М., 1968; Бирюкова Н.Ю. Западноевропейские набивные ткани 16—18 в.: Собрание Гос. Эрмитажа. М., 1973; Козлов В.Н. Основы художественного оформления текстильных изделий. М., 1981; Трызна Д.С. Беларускія дываны і габелены. Мн., 1981; Курилович А.Н. Белорусское народное ткачество. Мн., 1981; Кацар М.С. Беларускі арнамент: Ткацтва. Вышыўка: Пер. з рус. Мн., 1996; Сахута Я.М. Народнае мастацтва Беларусі. Мн., 1997.

Я.М.Сахута.



Да арт. **Тканіны мастацкія**. А.Сушчынская. Посцілка. Вёска Істакі Лідскага раёна Гродзенскай вобл. 1980.

ТКА́НКА ў арганізме, сістэма клетак, падобных па паходжанні, будове і функцыях, а таксама міжклетачных рэчываў і структур — прадуктаў іх жыццядзейнасці. Спрыяе трофіцы і каардынацыі функцыян. элементаў. У адпаведнасці з асн. саматычнымі функцыямі арганізма адрозніваюць 4 тыпы Т.: *эпітэлій, злучальная тканка*, мышачная Т. (*мышцы*), *нервовая тканка*. Развіццё (гістагенез) кожнага тыпу — вынік дыферэнцыроўкі — станаўлення рыс спецыялізацыі ў клетак-папярэдніц, дэтэрмінаваных у эмбрыягенезе для развіцця пэўнай Т. Звычайна адна Т. ці некат. яе спецыялізаваныя клеткі ажыццяўляюць спецыфічныя для кожнага арганізама функцыі. Комплексы клетак Т., што працуюць сумесна, утвараюць у органах шматлікія структурна-функцыян. адзінкі (напр., *нефрон*). Будова Т. аднаго тыпу (асабліва найб. высокаспецыялізаванай нервовай) можа значна адрозніваца ў розных ч. арганізма, а таксама ў арганізмаў рознага сістэм. становішча. У ніжэйшых мнагаклетачных функцыі Т. не так строга вызначаюцца, як у вышэйшых. Эвалюцыя арганізмаў прывяла да спецыялізацыі клетак і ўзаемаабумоўленасці іх функцыянавання ў шматтканкавай сістэме. У эксперыменце можна забяспечыць жыццё і размнажэнне Т. па-за арганізмам (гл. *Культура тканкі*). У жывёл Т. вывучае *гісталогія*.

Т. раслін — сістэма клетак структурна і функцыянальна ўзаемазвязаных адна з адной і звычайна падобных па паходжанні. Простая Т. складаецца з аднаго тыпу клетак (напр., *каленхіма*, складаная — з розных (напр., эпідэрма). Здольнасць да працяглага росту (адна з асаблівасцей раслін) вызначаецца ўтваральнымі Т. — *мерыстэмамі*, якія даюць пачатак пастаянным Т. Адрозніваюць 3 сістэмы пастаянных Т.: покрыўную (напр., эпідэрма, *перыдэрма, корка*), праводную (напр., *луб, ксілема*), асноўную (напр., *хларэнхіма*, каленхіма, *склераніхіма*), а таксама выдзяляльныя структуры, групы клетак або адзінкавыя клеткі (ідыёбласты), што ўключаюцца ў інш. Т., сістэму праветрывання (сукупнасць міжклетнікаў, вусцейкаў і сачавічкаў). У раслін Т. вывучае *анатомія раслін*.

А.С.Леанцюк.

ТКА́НКАВАЕ ДЫХА́ННЕ, клетачнае дыханне, сукупнасць акісляльна-аднаўленчых працэсаў, што прыводзяць да распаду арган. злучэнняў з утварэннем канчатковых прадуктаў абмену рэчываў і вызваленнем энергіі, якая забяспечвае жыццядзейнасць. У *аэробных арганізмаў* аснова Т.д. — працэс спажывання клеткамі і тканкамі кісларoду. *Гліколіз, трыкарбонавых кіслот цыкл* і дыхальны ланцуг характэрны для большасці *зўкарыётаў*. Вугляводы, тлушчы і бялкі (клетачнае «паліва») падвяргаюцца многаступеньчатаму акісленню з выхадам энергіі. Каля 50% яе назапашваецца ў клетках у форме энергіі хім. сувязей макраэргічных злучэнняў (напр., адэназінтрыфосфарная к-та); астатняя ч. ідзе на біясінтэз (напр., стэроідных гармонаў), абясшкоджванне чужародных і атрутных для арганізма рэчываў (напр., араматычных злучэнняў, недаакісленых прадуктаў дыхання), выдзяляецца ў выглядзе цяпла.

А.С.Леанцюк.

ТКА́НКАВАЯ ВА́ДКАСЦЬ, пазаклетачная вадкасць, вадкасць, якая запаўняе міжклетачныя прасторы ў тканках і органах жывёл і чалавека. Адцякае з органаў у лімфатычныя сасуды і ператвараецца ў *лімфу*. Утрымлівае прадукты абмену рэчываў і рэчывы, якія паступаюць з крыві. Складае 26,5% масы цела чалавека, каля 45% вады ў арганізме, разам з крывёй і лімфай утварае ўнутр. асяроддзе арганізма.

ТКА́НКАВАЯ НЕСУМЯШЧА́ЛЬНАСЦЬ, несумяшчальнасць імуналагічная, немагчымасць сумеснага існавання клетак і тканак, якія належаць генетычна розным асобінам і адрозніваюцца антыгенамі. Наяўнасць у *донара* і *рэцыпіента* генетычна абумоўленых антыгенных розніц выклікае ў арганізме рэцыпіента комплекс імун-

ных рэакцый, разбурэнне і адарванне трансплантаваных органаў і тканак донара. Вылучаюць 4 формы Т.н.: звышвостру́ю, паскара́ную, востру́ю, хранічную. У імуннай рэакцыі 3 фазы: распазнавання, імунізацыі, эфекторная (прыводзіць да гібелі трансплантата). У выніку рэакцыі развіваецца інфільтрацыя трансплантата лімфацытамі, пашкоджваюцца дробныя крывяносныя сасуды, узнікае ацёк, спыняецца крыва́ток, што прыводзіць да адарвання трансплантата.

Літ.: Сингер М., Берг П. Гены и геномы: Пер. с англ. Т. 2. М., 1998. Ройт А., Бростофф Дж., Мейл Д. Иммунология. М., 2000.

А.С.Леанцюк.

ТКА́НКАВАЯ СУМЯШЧА́ЛЬНАСЦЬ, гістасумяшчальнасць, магчымасць сумеснага існавання клетак і тканак, якія належаць генетычна падобным асобінам. Т.с. характарызуе стан, пры якім ахоўныя сістэмы арганізма не перашкаджаюць прыжыўленню і функцыянаванню клетак або органаў інш. арганізма (*донара*) у арганізме *рэцыпіента* (напр., крыві пры пераліванні, ныркі пры перасадцы). Поўная Т.с. існуе паміж тканкамі аднаяйцовых блізнят (генет. ідэнтычнасць). Гал. сістэма Т.с. — сямейства генаў, якія забяспечваюць саматычную індывідуальнасць і рэактыўнасць індывіда. Пры *тканкавай несумяшчальнасці* развіваецца імунная рэакцыя адарвання трансплантата. Высокая ступень Т.с. неабходна для паспяховых аперацый па перасадцы тканак і органаў.

Літ.: Ройт А., Бростофф Дж., Мейл Д. Иммунология. М., 2000.

А.С.Леанцюк.

ТКА́НКАВАЯ ТЭРАПІ́Я, лячэнне прэпаратамі з кансерваваных тканак жывёльнага (напр., водны экстракт плацэнты чалавека), расл. (сок, экстракт і лінімент альясу), таксама мінер. рэчывамі (ліманная гразь). Прапанавана У.П.*Філатавым* (1933). Ізаляваныя тканкі ў неспрыяльных умовах (холад, цемра) утвараюць *біягенныя стымулятары*, якія паскараюць абмен рэчываў, працэсы рэгенерацыі, аказваюць процізапаленчае дзеянне.

Прэпараты для Т.т. ўжываюцца звонку, унутр, як ін'екцыі і інш. Паказанні для Т.т.: захворванні вачэй (запаленне рагавіцы, кан'юнктывіты і інш.), апёкі, пролежні, гнойныя раны, траўмы, гінекалагічная паталогія, захворванні страўнікава-кішачнага тракту, прафілактыка заўчаснага старэння і інш.

І.М.Семяненя.

ТКА́ЦКІ СТАНО́К, станок для вырабу *тканіны тэкстыльнай*; асн. машына *ткацтва*. Адрозніваюць Т.с.: паводле спосабу пракладвання ўточнай ніткі — чаўнаковыя і *бесчаўнаковыя станкі*; змены ўтку—аўтам. і мех. з ручной зменай уточных паковак; паводле віду зеваўтваральнага механізма — эксцэнтрыкавыя, карэтачныя і жакардавыя (гл. *Жакарда машына*); па колькасці чаўнакоў — адна- і многачаўночныя.

На Т.с. ніткі *асновы*, якія змотваюцца з вял. шпулі (навоя), абгінаюць накіроўны валік (скало), прымаюць гарыз. або нахіленае становішча, праходзяць праз адтуліны ламелей і вочкі рамізак, што перамяшчаюць *ніткі* асновы ў верт. напрамку. Зеваўтваральны механізм раздзяляе ніткі асновы, утвараючы ромбападобную прастору (т. зв. зеў). У яго чаўнаком або пракладчыкам *утку* інш. тыпу ўводзіцца ўточная нітка, якая потым прыбіваецца да краю тканіны грэбенем (*бёрдам*), што робіць зваротна-паступальны рух разам з батанам. Вырабленая тканіна намотваецца на таварны валік.

Найпрасцейшыя ручныя Т.с. з'явіліся за 5—6 тыс. г. да н.э. (гл. *Кросны*). Механізацыя ткацтва пачалася ў перыяд мануфактуры ў Англіі. У 1785 Э.*Картрайт* вынайшаў механічны Т.с. (механізаваны аперацыі пракідвання чаўнака, падымання рамізак, прыбою ўточнай ніткі). У 1804—08 франц. ткач і вынаходнік Ж.М.Жакар стварыў машыну для вырабу ўзорыстых тканін (гл. *Жакарда машына*). Аўтам. Т.с. (з механізмам аўтам. змены ўточных шпуль) зрабіў англічанін Дж.Нортрап. Т.с. разам з мех. *прадзільнымі машынамі* адыгралі вырашальную ролю ў станаўленні машыннай тэхнікі.

ТКА́ЦТВА, сукупнасць тэхнал. працэсаў па вырабе *тканін тэкстыльных*. Уключае падрыхтоўчыя аперацыі, выраб тканін на *ткацкіх станках* і заключныя аперацыі апрацоўкі тканін.

Да падрыхтоўчых аперацый адносяцца перамотка нітак *асновы* і *ўтку*, снаванне, шліхтаванне, прабіранне асновы і звязванне канцоў нітак — стварэнне паковак нітак асновы і ўтке для работы на станку. Перамотка нітак асновы ажыццяўляецца на *матальных машынах* і аўтаматах, перамотка ўтку на шпулі для чаўнаковых станкоў — на ўточна-перамотачных аўтаматах. Для *бесчаўнаковых станкоў* выкарыстоўваюцца бабіны з матальных або прадзільных машын. Уточная пража праходзіць дадатковыя аперацыі — увільгатненне, эмульгаванне, запарванне. Пры снаванні ніткі з вял. колькасці бабін або шпуль навіваюцца на снавальны валік (на снавальных машынах). Для павышэння трываласці, зносаўстойлівасці, супраціўляльнасці сціранню і расцяжэнню ніткі асновы шліхтуюцца — прамочваюцца клейкім калоідным растворам (шліхтай). У вочкі (дзіркі) галеў рамізак ніткі прасоўваюць для ўтварэння зева на станку (прастора для руху чаўнака) і атрымання тканіны зададзенага перапляцення. Прабіранне нітак у зубы бёрда забяспечвае ўшчыльненне ўточнай ніткі і атрыманне неабходнай шчыльнасці тканіны на аснове. З падрыхтаваных нітак асновы і ўтку на ткацкіх станках вырабляюць тканіны пэўных перапляценняў, шчыльнасці і шырыні. Заключныя аперацыі: вымярэнне даўжыні тканіны, чыстка, стрыжка (на *стрыгальных машынах*), кантроль якасці (паводле колькасці дэфектаў вызначаецца гатунак тканіны) і ўкладка, што ажыццяўляюцца на паточных лініях.

Т. вядома з 6—5-га тыс. да н.э. на Б.Усходзе (Сірыя, Месапатамія, Егіпет). Пазней удасканальваліся канструкцыі станка, ствараліся прыстасаванні для падрыхтоўкі пражы. Механізацыя працэсаў Т. адносіцца да 16—18 ст. У канцы 19—20 ст. створаны станкі з аўтам. зменай чаўнакоў, у пач. 20 ст. — бесчаўнаковыя.

На Беларусі Т. вядома з часоў позняга неаліту і ранняга бронзавага веку. У 11—13 ст. выраблялі тканіны палатняныя, саржавыя, што сведчыць пра высокі ўзровень развіцця Т. Для вырабу тканін выкарыстоўвалі 4-нітовае прыстасаванне, якое нагадвала бердзечка (прыстасаванне для Т. паясоў). Бел. нар. Т. 19 — пач. 20 ст. адлюстроўвае багаты маст. і тэхн. вопыт рамяства: пераважна 2- і 4-нітовая тэхніка, бранае і выбарнае Т., перабор «пад палатно» і інш. (гл. *Тканіны мастацкія*). З канца 19 ст. існавалі саматужныя ткацкія промыслы, якія выраблялі тканіны на продаж: ствараліся ткацкія школы-майстэрні, дзе павышаўся якасны ўзровень саматужнага Т. ў выніку ўкаранення больш дасканалага абсталявання, выкарыстання новых тэхнік Т. (напр., шматнітовае Т., розныя віды перабору). З 1930-х г. традыцыйнае нар. Т. пачало скарачацца. У канцы 20 ст. лепшыя традыцыі бел. нар. Т. распрацоўваліся на Аршанскай, Гомельскай, Гродзенскай, Пінскай, Полацкай, Слуцкай фабрыках маст. вырабаў (гл. адпаведныя арт.).

І.У.Косціна.

ТКАЧ Уладзімір Міхайлавіч (н. 27.5.1956, Мінск), бел. баяніст, кампазітар, аранжыроўшчык. Засл. арт. Беларусі (2001). Скончыў Бел. кансерваторыю (1982). З 1980 саліст Дзярж. акад. нар. аркестра імя І.Жыновіча, адначасова з 1984 у складзе трыо баяністаў пры аркестры. Сярод твораў: вальс-мазурка (1976), муз. карцінка «Ясь і Яніна» (1992), для дуэта гармонікаў у суправаджэнні аркестра «Гармонік-частушка» (2000), для нар. арк. «Серэнада», рапсодыя «Вочы чорныя» з арк. (абодва 2001), уверцюра «Святочны рэверанс», п'еса-экспромт «Натхненне» (абедзве 2002) і інш., а таксама аранжыроўкі і канцэртныя ап-



Ткацкі станок: а — старажытны хатні гарызантальны ткацкі стан «на сохах» (Бабруйскі павет); б — схема прамысловага станка (1 — чаўнок, які пракладвае нітку ўтку; 2 — бёрда; 3 — ламелі; 4 — ніткі асновы; 5 — навой; 6 — рамізка; 7 — батан; 8 — падбатанны вал; 9 — накіравальны і таварны валікі.

рацоўкі нар. мелодый для трыо баянаў і інш. *М.Р.Солапаў.*

ТКАЧО́ВЫ, расійскія і бел. жывапісцы, браты. Нарадзіліся ў с. Чугунаўка Бранскай вобл., Расія. Нар. мастакі СССР (1983). Правадз. члены АМ СССР (1978). Аляксей Пятровіч (н. 11.9.1925). Скончыў Маскоўскі маст. ін-т імя В.Сурыкава (1951). З 1951 жыў у Мінску. Сяргей Пятровіч (н. 10.11.1922). Скончыў Віцебскае маст. вучылішча (1941), Маскоўскі маст. ін-т імя Сурыкава. З 1952 жыў у Мінску. З 1955 абодва ў Маскве. Творы вызначаюцца ачувальнасцю святлопаветранага асяроддзя, экспрэсіўнай мадэліроўкай аб'ёму колеравымі плямамі, глыбокім псіхалагізмам у перадачы рэчаіснасці: «Каля калодзежа» (1954), «У цяжкія гады» (1955—57), «Паміж баямі» (1959—60), «Маткі» (1961), «За зямлю, за волю» (1970), «Вяселле» (1970—72), «Пара сенакосная» (1975), «Чэрвеньская пара» (1976—77), «Май 1945 года» (1979—81), «Вышывальшчыцы сцягоў» (1984—87), «Сыны» (1985—87), «Ліхалецце. Рускае поле» (1986—91), «Адзін крыж» (1992), «Лёс ветэрана» (1994—95), «Успаміны пра маці» (1996), «Дарога да храма» (2000). Аўтары трыпціхаў «Сям'я Пакетавых» (1964), «Астраханскія рыбакі» (1968). Дзярж. прэмія Расіі імя І.Рэпіна 1968. Дзярж. прэмія СССР 1978.

Тв.: Художники о себе. М., 2000.

Літ.: Братья Ткачевы: Этюды. М., 2000; Братья Ткачевы. М., 2001. *С.У.Пешын.*

ТКАЧО́НАК Аляксандр Леанідавіч (н. 20.11.1950, г. Чашнікі Віцебскай вобл.), бел. акцёр. Нар. арт. Беларусі (1998). Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1975). З 1975 акцёр Нац. акад. драм. т-ра імя М.Горкага. Мастацтва Т. вызначаецца арганічнасцю, псіхал. глыбінёй, пластычнай выразнасцю, дакладнасцю знешняга малюнка ролі, разнастайнасцю моўных характарыстык. Сярод роляў: Лешч, поп Паўлін, Акцёр, Якаў Багалюбаў («Апошнія», «Ягор Булычоў і іншыя», «На дне», «Букееў і кампанія» М.Горкага), Лапахін («Вішнёвы сад» А.Чэхава), Компас («Дзялок» А.Талстога), Мальер («Мальер» М.Булгакава), Фарацьеў («Фантазіі Фарацьева» А.Сакаловай), Падсякальнікаў («Тэрмінова патрабуецца... «самазабойца» М.Эрдмана), Мечыслаў Вальпура («Вар'ят і манахіня» С.Віткевіча), Освальд («Здані» Г.Ібсена), Жэронт («Адзіны наследнік» Ж.Ф.Рэньяра), Пічэм («Трохграшовая опера» Б.Брэхта), Пісьменнік («Хто там?» Ж.Рабера), Саймон («Цяжкія людзі, ці Жаніх з Іерусаліма» І.Бар-Іосіфа) і інш. Шлях спасціжэння героем чалавечай



А.Л.**Ткачонак**.



В.Дз.**Ткачоў**.

годнасці, нязломную сілу духу простага селяніна выявіў у вобразе Петрака ў спектаклі «Знак бяды» паводле В.Быкава (Дзярж. прэмія Беларусі 1986). Як рэжысёр паставіў спектакль «Шум за сцэнай» («Тэатр») М.Фрэйна (1989). Здымаецца ў кіно («Раскіданае гняздо», «Жыў-быў доктар», «Міхайла Ламаносаў») і тэлевіз. пастаноўках («Шчаслівы» паводле К.Рапапорта і М.Маклярскага, «Тэатр купца Япішкіна» Е.Міровіча, «Федра» Ж.Расіна). *Н.А.Крывашэева.*

ТКАЧО́НАК Анатоль Аляксеевіч (14.3.1922, в. Селішча Бешанковіцкага р-на Віцебскай вобл. — 13.11.1994), бел. мастак. Вучыўся ў Віцебскім маст. вучылішчы (1937—40). Быў мастаком на прадпрыемствах Віцебска, Мінска, Карэліі, Эстоніі. Працаваў пераважна ў жанры пейзажа ў тэхніках акварэлі, алею. Творы вызначаюцца шчырасцю, тонкім лірыка-паэт. успрыманнем прыроды. Сярод іх: «Цёплы дзень» (1944), «Поле», «Майскі дзень», «У парку», «Дворык», «На беразе возера», «Вайсковы эцюд» (усе 1948), «На таку» (1959), «Рэчанька» (1960), «Жнівень» (1964), «Поле восеньскае» (1965), «Летні матыў» (1966), «Хмары над іржышчам» (1967), «Першы спеў» (1969), «Цішыня» і «Заходняя Дзвіна ў Бешанковічах» (абодва 1970), «Прасторы Наваполацка» і «Старадаўнасць Полацка» (абодва 1972), «На пляцоўцы» (1973), «Акно» (1975), «Восеньскае» (1980), «Чэрвень» і «Зямля восеньская. Забор'е» (абодва 1984), «Да восені. Букет» (1986), «Вятры перадасеннія» (1988). *Л.Ф.Салавей.*

ТКАЧО́Ў Валянцін Дзмітрыевіч (19.2.1939, Мінск — 16.2.1985), бел. фізік. Чл.-кар. АН Беларусі (1974). Д-р фіз.-матэм. н. (1968), праф. (1969). Засл. дз. нав. Беларусі (1980). Скончыў БДУ (1961). З 1962 у БДУ (з 1964 заг. лабараторыі, з 1966 заг. кафедры, адначасова з 1972 заг. аддзела НДІ прыкладных фіз. праблем). З 1976 у БПІ (рэктар), з 1983 у Ін-це фізікі цвёрдага цела і паўправаднікоў АН Беларусі (заг. лабараторыі). Навук. працы па фізіцы паўправаднікоў, радыяцыйнай фізіцы і спектраскапіі цвёрдага цела, паўправадніковай электроніцы. Абгрунтаваў мадэль утварэння ўстойлівых радыяцыйных дэфектаў у паўправадніковых матэрыялах. Распрацаваў высокаадчувальныя аптычныя метады даследавання дэфектаў у паўправадніках. Прэмія Ленінскага камсамола Беларусі 1972.

Тв.: Модель рекомбинации в германии *n*-типа, облученном γ-квантами ^{60}Co (разам з В.І.Уранёвым, В.Ю.Явідам) // Физика и техника полупроводников. 1976. Т. 10, вып. 9; Люминесценция на дислокациях в кремнии (у сааўт.) // Журн. прикладной спектроскопии. 1977. Т. 27, вып. 2; Обнаружение химической активности благородных газов в кремнии методом люминесценции (у сааўт.) // Докл. АН БССР. 1979. Т. 23, № 4.

ТКАЧО́Ў Васіль Юр'евіч (н. 1.1.1948, в. Гута Рагачоўскага р-на Гомельскай вобл.), бел. пісьменнік. Скончыў Львоўскае вышэйшае ваен.-паліт. вучылішча (1973). Працаваў у газетах. З 1989 сакратар Гомельскага абл. аддзялення Саюза бел. пісьменнікаў. Друкуецца з 1965. Выдаў кнігі апавяданняў «Хітры Данік» (1975), «Дзень у горадзе» (1985), кнігу-дзённік «Пахвалі пражыты дзень» (1988). Аўтар нар. драмы пра паслявае. бел. вёску «Сівы бусел», п'есы «Вокны» (абедзве паст. 1985), камедый «Прыгоды з Канапухіным», «Лесвіца» (абедзве паст. 1988), «Кветкі-ягадкі, альбо Курорт для зяця» (паст. 1990 Бел. т-рам імя Я.Коласа), «Шкірдзюкі займаюць абарону», трагікамедыі пра паслячарнобыльскую бяду «Усміхаўся месяц белай вішні» (абедзве паст. 1996), п'ес «Блакада ў Кругліцы» (1994), «Дурная баба» (1997), «Дрэва, альбо Жыццё ў адсутнасць дажджу» (1998), «Слуп» (2001) і інш., аднаактовак («Стары і дарога»,



А.**Ткачонак** у ролі Жэронта.

«Кубік Рубіка», «Дублёр», «Арышт» і інш.). На бел. мову пераклаў п'есы Л.Петрушэўскай «Маскоўскі хор», С.Злотнікава «Сцэны каля фантана».

Тв.: Недоразумения. Гомель, 1997; Седой аист. Мозырь, 1997. *І.У.Саламевіч.*



М.**Ткачоў**.



М.А.**Ткачоў**.

ТКАЧО́Ў Мікола (Мікалай Гаўрылавіч; 8.3.1918, в. Горанка Краснапольскага р-на Магілёўскай вобл. — 20.4.1979), бел. пісьменнік. Скончыў Бел. ін-т нар. гаспадаркі (1939). З 1943 у рэд. магілёўскай абл. газ. «За Радзіму», з 1949 у час. «Полымя», з 1957 гал. рэд. газ. «Літаратура і мастацтва», з 1959 сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі. У 1972—79 дырэктар выд-ва «Мастацкая літаратура». Друкаваўся з 1938. Аўтар рамана «Згуртаванасць» (1949—50) пра ўсенародны характар партыз. руху на Беларусі ў Вял. Айч. вайну. У кнігах прозы «Пошукі скарбаў» (1963), «Дыханне агню» (1978) тэмы штодзённай працы людзей, хараства душы чалавека, роздум над жыццём, яго сэнсам, узвышанае пачуццё любові да роднай зямлі, маральна-этычныя праблемы. На бел. мову перакладаў творы з англ. (М.Твэн), лат., малд. (В.Рошка), рус. (С.Варонін, М.Прыляжаева, Я.Фёдараў), укр. і інш. л-р.

Тв.: Дыханне агню: Раман, апавяданні. Мн., 1988.

Літ.: Пашкевіч Н. На шырокіх шляхах жыцця. Мн., 1965. С. 66—90.

ТКАЧО́Ў Міхаіл Аляксандравіч (10.3.1942, г. Мсціслаў Магілёўскай вобл. — 31.10.1992), бел. археолаг, гісторык-медыявіст, грамадска-паліт. дзеяч. Д-р гіст. н. (1987), праф. (1989). Скончыў БДУ (1964). З 1968 у Ін-це гісторыі АН Беларусі, з 1978 у Гродзенскім ун-це (у 1983—85 заг. кафедры). Заснавальнік і кіраўнік гісторыка-культ. клуба «Паходня» ў Гродне. З 1989 заг. рэдакцыі гісторыі Беларусі, з крас. 1992 гал. рэдактар выд-ва «Беларуская Энцыклапедыя». Вывучаў ваен. гісторыю Беларусі, абарончае дойлідства, матэрыяльную культуру і архітэктуру гарадоў Беларусі 10—18 ст. Адзін з аўтараў кніг «Нарысы па археалогіі Беларусі» (ч. 2, 1972), «Асвета і педагагічная думка ў Беларусі» (1985), «Гісторыя беларускага мастацтва» (т. 1—2, 1987—88), «Беларуская кафля» (1989), «Старажытны Мсціслаў» (з А.Трусавым), «Вялікае мастацтва артылерыі» (з А.Бельскім; абедзве 1992). З 1989 нам. старшыні сойма Бел. нар. фронту «Адраджэнне», заснавальнік і старшыня Цэнтр. рады Бел. сацыял-дэмакр. грамады (1991—92).

Тв.: Вежы валынскага тыпу і іх распаўсюджванне на Беларусі // Беларускія старажытнасці. Мн., 1972; Замкі Беларусі (XIII—XVII ст.). Мн., 1977; Абарончыя збудаванні заходніх зямель Беларусі XIII—XVIII стст. Мн., 1978; Замки Белоруссии. Мн., 1987; Замкі і людзі. Мн., 1991; Паходня. Мн., 1994.

Літ.: Castrum, urbis et bellum: Зб. навук. прац. Баранавічы, 2002. *М.М.Чарняўскі.*

ТКАЧО́Ў Павел Іванавіч (3.9.1930, с. Скадаінаўка Каменскага р-на Растоўскай вобл., Расія — 1.1.1998), бел. пісьменнік, літ.-знавец. Д-р філал. н. (1981), праф. (1982). Засл. работнік вышэйшай школы Беларусі (1983). Скончыў БДУ (1955). З 1955 працаваў у газ. «Зорька», «Піянер Беларусі» (1960—64). З 1969 у БДУ (у 1981—86 дэкан ф-та журналістыкі). Друкаваўся з 1947. Пісаў на бел. і рус. мовах пераважна для дзяцей: кн. «Мікіткаў падарунак» (1960), «Вішнёвая квецень» (1965), «Самае галоўнае» (1977), аповесці «Пра Сяргейку і лясных жыхароў» (1961), «Піліпка з Галубінай Слабодкі» (1969), «Граніца была побач» (1972). Даследаваў памфлет і сатыру: манаграфіі «Вечны бой: (Памфлетная спадчына Я.Галана і традыцыі М.Горкага)» (1970), «Іду на вы» (1975), «Граніцы жанру» (1977).

Тв.: Час світальнай зоркі: Выбранае. Мн., 1980; «Сатиры злой звенящая строка...»: Природа смеха в памфлете. Мн., 1980; Силуэты прошлого: Очерки, эссе, заметки. Мн., 1983; У ліпені 1917 г. Мн., 1986; Пралескі яе вясны: Аповесці і нарысы. Мн., 1988; Быў месяц кастрычнік: Аповесць, апавяданні. Мн., 1991. *І.У.Саламевіч.*

ТКАЧО́Ў Уладзімір Віктаравіч (н. 25.1.1947, в. Нізок Уздзенскага р-на Мінскай вобл.), бел. мастак. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1974), у 1974—76 і 1978—82 выкладаў у ім. Працуе ў манум.-дэкар. мастацтве, станковым жывапісе. Творы на тэмы рэліг., чарнобыльскую, вечнасці, сучаснасці, мудрасці чалавечага быцця вылучаюцца своеасаблівым адлюстраваннем этычных праблем, перададзеных вострай гратэскавай мовай. Сярод асн. твораў: габелены «Музыка» ў Бел. філармоніі (1976), «Беларусь — край родны» ў рэзідэнцыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у Мінску, «Беларусь» для пасольства СССР у Вашынгтоне (абодва 1984); вітражы «Песні Беларусі» і «Поры года» ў Бел. рэсп. т-ры юнага гледача (абедзве 1978; у сааўт.); жывапісныя палотны «Алегорыя лета» (1978), «Вечнае» (1980), «Карабель», «Тайная вячэра» (абодва 1990), «Вячэрняя рыбная лоўля з канцэртам Вато» (1996), «Прыбыццё»,



У.**Ткачоў**. Мёртвая рыба. 1997.

ТКАЧО́Ў Пётр Мікітавіч (11.7.1844, с. Сіўцова Пскоўскай вобл., Расія — 4.1.1886), дзеяч рас. рэв. руху, ідэолаг «змоўніцкай», або «якабінскай», плыні ў *народніцтве*, публіцыст. Скончыў Пецярбургскі ун-т (1868). З 1865 супрацоўнічаў з час. «Русское слово» і «Дело». За арганізацыю студэнцкіх хваляванняў у Пецярбургу у 1869 асуджаны на непрацяглае турэмнае зняволенне, пасля адбыцця якога высланы на радзіму. У 1873 уцёк за мяжу, жыў у Швейцарыі і Францыі, супрацоўнічаў у час. «Вперед!», далучыўся да польска-рус. эмігранцкай групы «рускіх якабінцаў», выдаваў час. «Набат» (1875—81), у якім прапагандаваў свае ідэі. Быў адным з заснавальнікаў (1877) малаўплывовага ў Расіі «Таварыства народнага вызвалення». У 1882 цяжка захварэў, апошнія гады жыцця правёў у псіхіятрычнай лячэбніцы. Т. не верыў у здольнасць сялянства самастойна здзейсніць сац. рэвалюцыю, даказваў неабходнасць стварэння тайнай арг-цыі «рэв. меншасці» з мэтай захопу ўлады, усталявання рэв. дыктатуры і правядзення сац. пераўтварэнняў. У сваіх філас. поглядах абараняў *матэрыялізм* і адмаўляў *ідэалізм*, лічыў эканам. фактар важнейшым рычагом сац. развіцця. У літ. крытыцы выступаў паслядоўнікам М.Г.Чарнышэўскага, М.А.Дабралюбава, Дз.І.Пісарава.

Тв.: Соч. Т. 1—2. М., 1975—76.

Літ.: Шахматов Б.М. П.Н.Ткачев: Этюды к творч. портрету. М., 1981; Рудницкая Е.Л. Русский бланкизм: Петр Ткачев. М., 1992.

«Галгофа», «Мёртвая рыба» (усе 1997), «Стаўка» (2000), «Спакуса картачных каралёў» (2001), «Новая Галгофа», «Эпіцэнтр развіцця» (абодва 2002), трыпціхі «Ф.Скарыне прысвячаецца» (1988), «Паўлюк Трус» (1993). *І.Л.Чэбан.*

ТКАЧУ́К Аксана Фёдараўна (н. 10.6.1933, С.-Пецярбург), бел. архітэктар. Засл. архітэктар Беларусі (1976). Скончыла Ін-т жывапісу, скульптуры і архітэктуры ў Ленінградзе (1958). З 1960 працавала ў ін-це «Мінскпраект», у 1977—83 гал. мастак Мінска, адначасова нам. гал. архітэктара горада. Кіраўнік аўтарскага калектыву праектаў будынкаў Ін-та нар. гаспадаркі (1964—74), жылых дамоў па вул. Старавіленскай (1977—79), будынка Дзярж. т-ра муз. камедыі Беларусі ((1981), Палаца культуры вытв. тонкасуконнага аб'яднання (1984), планіроўкі і забудовы мікрараёнаў Ракаўская шаша 6 і 7 у Мінску. Сярод інш. работ (у сааўт.): праекты рэстарана «Журавінка» (1969) у Мінску, рэканструкцый Бел. т-ра імя Я.Коласа ў Віцебску (1985), будынкаў 19 ст. па вул. Камсамольскай ў Мінску (1999) і інш.

ТКАЧУ́К Васіль Мітрафанавіч (н. 11.9.1926, в. Мінькаўцы Андрушэўскага р-на Жытомірскай вобл., Украіна), бел. графік. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1961). Працуе ў галіне станковай графікі. Творы адметныя выразнасцю і лаканічнасцю, прасякнуты пачуццём часу: «Стары парк» (1964), «Раўбічы» (1968), «Зіма» (1982), «Зімовая цішыня» і «Хвоі над Нёманам» (абодва 1983), «Партрэт Я.Купалы» і «Партрэт Я.Коласа» (абодва 1984—85), «Безыменная вышыня» (1989), «Іней» (1994), «Плошча Перамогі» і «Світанак над Мінскам» (абодва 1996); серыі «На Прыпяці» (1961), «На Палессі» (1962), «Гродзенскі азотнатукавы завод» (1965), «Мінск будуецца» (1961—67), «На будаўніцтве Лукомскай ДРЭС» (1967), «Крэпасць над Бугам» (1961—86), «Стары Мінск» (1975—86), «На радзіме Янкі Купалы» (1980—83), «Сталявары» (1989). *Л.Ф.Салавей.*



М.М.**Ткачэнка**.

ТКАЧЫ́, т к а ч ы к а в ы я, група птушак сям. ткачыкавых (Ploceidae) і ўюрковых ткачыкаў (Estrildidae). Найб. вядомыя Т. з родаў: грамадскі (1 від), сапраўдныя (57 відаў), агнявыя (11 відаў), амаранты (6 відаў): амадзіны, астрыльды, удоўкі. Пашыраны ў асн. у субтропіках і тропіках Усх. паўшар'я, пераважна ў Афрыцы. Жывуць на адкрытых ландшафтах. Чародныя, часта каланіяльныя. 4 віды і 1 падвід у Чырв. кнізе МСАП.

Даўж. цела да 30 см, маса да 100 г; хвост ад кароткага да вельмі доўгага. Апярэнне рознае — да ярка чырв. або сіняга. Гнёзды «ткуць» (адсюль назва) з расл. валокнаў. Кормяцца зернем, насякомымі. Многія шкоднікі.

ТКАЧЭ́НКА Анатоль Панцялеевіч (н. 5.10.1938, г. Кіраўск Луганскай вобл., Украіна), бел. вучоны ў галіне тэлекамунікацый і тэлевізійных сістэм. Канд. тэхн. н. (1969), дацэнт (1974). Скончыў Ленінградскі электратэхн. ін-т сувязі (1962). З 1970 у Бел. ун-це інфарматыкі і радыёэлектронікі (у 1992—97 праф.). Навук. працы па пытаннях кабельнага тэлебачання і лічбавага радыё- і тэлевяшчання, валаконна-аптычных лініях сувязі для рэпартажных комплексаў каляровага і кабельнага тэлебачання; па стварэнні дыягнастычных прылад для каляровых тэлевізійных прыёмнікаў. Адзін з аўтараў і навук. рэдактар энцыкл. даведніка «Бытавая радыёэлектронная тэхніка» (1995).

Тв.: Цветное телевидение. Мн., 1981; Телевидение и передача изображений. Мн., 1988 (разам з У.І.Кірылавым); Англо-русский словарь по телевидению, аудио- и видеотехнике. 2 изд. Мн., 1999 (разам з У.М.Цацуліным).

ТКАЧЭ́НКА Міхаіл Мікалаевіч (май 1922, г.п. Бешанковічы Віцебскай вобл. — 9.3.1948), Герой Сав. Саюза (1944). Скончыў Новасібірскую ваен.



В.**Ткачук**. «Цярэспальскія вароты». З серыі «Крэпасць над Бугам». 1985.



Ткачы: 1 — чорнагаловы ткачык; 2 — каралеўская ўдоўка; 3 — райская ўдоўка; 4 — гранатавы астрыльд; 5 — чырвонагаловая амадзіна; 6 — грамадскі ткачык; 7 — агнявы ткачык; 8 — чырванадзюбы ткачык.

авіяшколу лётчыкаў (1942). У Чырв. Арміі з 1940. На фронце з 1942, удзельнік баёў на Паўн. Каўказе, Украіне, у Крыме, Румыніі, Венгрыі. Камандзір звяна штурмавікоў лейт. Т. да пач. 1944 зрабіў 103 баявыя вылеты, за час вайны — 150, удзельнічаў у 7 паветр. баях, збіў самалёт праціўніка.



Н.А.**Ткачэнка**.



Н.**Ткачэнка** ў ролі Яраслаўны.

ТКАЧЭ́НКА Нінель Аляксандраўна (н. 21.11.1928, г. Харкаў, Украіна), украінская і бел. спявачка (драм. сапрана). Нар. арт. СССР (1964). Скончыла Харкаўскую кансерваторыю (1958). З 1958 салістка опернай студыі Кіеўскай кансерваторыі і Львоўскага т-ра оперы і балета, з 1962 Дзярж. т-ра оперы і балета Беларусі, з 1968 — Адэскага т-ра оперы і балета, з 1981 Маскоўскай філармоніі. Валодае моцным рухомым голасам шырокага дыяпазону; яе выканальніцкая манера спалучае вял. ўнутр. эмацыянальнасць з вонкавай стрыманасцю. Сярод выкананых партый класічнага і сучаснага рэпертуару на бел. сцэне: Касандра («Арэстэя» С.Танеева), Дэздэмона, Аіда, Леанора («Атэла», «Аіда», «Трубадур» Дж.Вердзі), Марына («Кастрычнік» В.Мурадэлі), Яраслаўна («Князь Ігар» А.Барадзіна), Таццяна, Ліза («Яўген Анегін», «Пікавая дама» П.Чайкоўскага), Тоска («Тоска» Дж.Пучыні). Вяла канцэртную дзейнасць. Лаўрэат 2-га Усесаюзнага конкурсу вакалістаў імя М.Глінкі (1962).

Літ.: Черкашина М. Голоса молодых // Сов. музыка. 1964. № 11; Ракава А.Я. Нінэль Ткачэнка // Слова пра майстроў сцэны. Мн., 1967.

ТКАЧЭ́НКА Уладзімір Аляксандравіч (н. 30.10.1948, Мінск), бел. жывапісец. Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1971). З 1979 кіруе студыяй пры Палацы культуры Мінскага трактарнага з-да. Працуе ў жанрах пейзажа, партрэта, нацюрморта. Лірычныя інтанацыі арганічна з'яднаны з эпічнасцю мыслення і філас.-маст. спасціжэннем духоўнасці. Сярод твораў: «Стары Мінск» (1976), «Край азёр і балот», «Шумяць дубы», «Іней» (усе 1978), «Песня восені» (1979), «Квітнее май», «У партызаны», «Залатыя палі» (усе 1980), «Лена», «Цвітуць лугі», «Ноч на лясным возеры» (усе 1981), «Снежань» (1984), «Асенні спакой», «Мы з вечнасцю будзем народуні» (абодва 1985), «Бацькаўшчына» (1986—87), «Ефрасіння Полацкая» (1987—89), «Апошняе цяпло» (1989—91), «Маліцвы» (1991), «Звон» (1991—92), «Божы след» (1994), «Цішыня», «На зямлі мір» (абодва 1996—97), «Жніво» (1998), «Шэпт камянёў» (1999), «Пакаянны канон», «Карункі восені», «Квітнеючы май» (усе 2001), «Радзіма» (2002).

Л.Ф.Салавей.



У.**Ткачэнка**. Шэпт камянёў. 1999.

ТКАЧЭ́НКА Уладзімір Мікалаевіч (н. 11.3.1953, г. Лебядзін Сумскай вобл., Украіна), бел. скрыпач, гітарыст, кампазітар-аранжыроўшчык. Засл. арт. Беларусі (1997). Скончыў Бел. кансерваторыю (1977). З 1977 у ансамблі «Песняры», з 1985 у джазавым квінтэце пад кіраўніцтвам І.Сафонава, з 1987 артыст і аранжыроўшчык Дзярж. аркестра сімф. і эстр. музыкі Беларусі пад кіраўніцтвам М.Фінберга. Сярод твораў: для эстр.-сімф. арк. «Сюіта на тры беларускія тэмы» (1989), «Сімфонія» Бітлз (1997), «Сімфонія» Песняроў (2001); п'есы для камернага арк., джаз-ансамбля, сола для электрагітары (якія выконваюцца нетрадыц. спосабам гуказдабывання). Аўтар аранжыровак для фестывалю «Славянскі базар у Віцебску» (1992—2002), Маладзечанскага фестывалю беларускай песні і паэзіі (1993, 1995, 1998, 2001), тэлеконкурсу «Ступень да Парнаса» (1994), забаўляльных тэлеперадач у Італіі (1988—92) і інш. *Л.А.Шымановіч.*

ТКВАРЧЭ́ЛІ, горад у Абхазіі, у Рэспубліцы Грузія, на р. Галідзга. Каля 30 тыс. ж. (2001). Чыг. ст., вузел аўтадарог. Цэнтр здабычы каменнага вугалю. Прам-сць: швейная, буд. матэрыялаў. Тэатр. Бальнеалагічны курорт.

ТЛАДЫЯ́НТА (Thladiantha), род кветкавых раслін сям. гарбузовых. Каля 15 відаў. Пашыраны ў Паўд.-Усх. Азіі. На Беларусі 1 від — Т. няпэўная (T.dubia). Культывуецца як дэкар. павойная расліна, часам дзічэе.

Шматгадовыя травяністыя расліны з клубнепадобна патоўшчанымі каранямі. Сцёблы даўж. да 4 м, лазяць пры дапамозе вусікаў. Лісце простае, суцэльнае, сэрцападобнае, на доўгіх чаранках. Кветкі аднаполыя (тычынкавыя ў гронках або адзіночныя, песцікавыя адзіночныя), жоўтыя, званочкавыя. Плод — цыліндрычная чырв. мясістая салодкая гарбузіна. *А.М.Скуратовіч.*

ТЛЕМСЕ́Н, горад на ПнЗ Алжыра. Адм. ц. аднайм. вілайі. Вядомы з 3 ст. н.э. як рым. горад Памарыя. Каля 200 тыс. ж. (2001). Вузел чыгунак і аўтадарог. Аэрапорт. Прам-сць: харчасмакавая, тэкст., апрацоўка кары коркавага дуба. Дыванаткацтва. Ун-т. Археал. музей. У Т. і паблізу — арх. помнікі 12—14 ст.; руіны рым. паселішчаў.

ТЛЕНДЫЕЎ Нургіс Атабаевіч (н. 1925), казахскі дырыжор, кампазітар. Нар. арт. Казахстана (1975). Нар. арт. СССР (1984). Скончыў Алма-Аціпскую (1949) і Маскоўскую (1953) кансерваторыі. У 1940—43 у Каз. аркестры нар. інстру-

ментаў імя Курмангазы (у 1960—64 яго гал. дырыжор). У 1953—60 дырыжор Каз. т-ра оперы і балета імя Абая. У 1968—81 гал. муз. рэдактар кінастудыі «Казахфільм». З 1981 маст. кіраўнік і гал. дырыжор фалькл.-этнагр. аркестра «Атрар сазы» Каз. філармоніі. Аўтар муз. твораў розных жанраў. Дзярж. прэмія Казахстана 1978.

ТЛІ, тлёвыя (Aphidinea), падатрад паразітычных сысучых насякомых атр. раўнакрылых. 11 сям., каля 3 тыс. відаў. Пашыраны ўсюды, найб. — ва ўмераным поясе Паўн. паўшар'я. Жывуць пераважна калоніямі. Асобныя віды прыстасаваны да пэўных раслін-гаспадароў і іх частак. Многія Т. шкодзяць раслінам, у т.л. с.-г.; пераносчыкі ўзбуджальнікаў вірусных хвароб раслін. На Беларусі трапляюцца прадстаўнікі 2 надсям.: сапраўдныя тлі (Aphidoidea) і хермесавыя (Adelgoidea); найб. — прадстаўнікі родаў афіс (Aphis), ацыртасіфан (Acyrthosiphon), капітафорус (Capitophorus), макрасіфум (Macrosiphum) і інш.

Даўж. да 6 мм. Цела яйцападобнае, авальнае або падоўжанае, зверху пукатае. Крылаў 2 пары, ёсць бяскрылыя формы. Вусікі 3—6-члянікавыя з органамі пачуццяў. Ротавы апарат колюча-сысучы. Скурнае покрыва тонкае, мяккае, у некат. з васковым налётам. Афарбоўка звычайна пад колер раслін. Вочы складаныя або простыя. Характэрны рэзка выражаны полімарфізм, чаргаванне палавога і партэнагенет. пакаленняў. Развіццё з няпоўным ператварэннем. За год 2—25 пакаленняў. Выдзяленнямі Т. кормяцца многія насякомыя, іх збіраюць пчолы як *падзевы мёд*.

С.Л.Максімава.

ТЛУМАЧА́ЛЬНЫ СЛО́ЎНІК, лінгвістычны аднамоўны слоўнік, у якім словы падаюцца з апісаннем (тлумачэннем) іх значэння і сферы выкарыстання. Т.с. вызначаюць лексічныя нормы літ. мовы на пэўным этапе яе развіцця. У ім даюць грамат. акцэнтуацыйныя і правапісныя характарыстыкі слоў, нормы іх спалучальнасці, фіксуюць устойлівыя словазлучэнні тэрміналагічнага і фразеалагічнага характару з раскрыццём іх значэння, паказваюць паходжанне іншамоўных слоў. Як камбінаваны лексікаграфічны даведнік Т.с. займае гал. месца ў нац. лексікаграфіі і з'яўляецца паказчыкам агульнага ўзроўню яе развіцця.

Для вывучэння рус. літ. мовы 19—20 ст. найб. важнае значэнне маюць акад. «Слоўнік царкоўнаславянскай і рускай мовы» (вып. 1—4, 1847; 2-е выд., 1867—68), «Тлумачальны слоўнік жывой велікарускай мовы» У.І.Даля (ч. 1—4, 1863—66; т. 1—4, 7-е выд. 1978—80), «Тлумачальны слоўнік рускай мовы» (т. 1—4, 1935—40), «Слоўнік сучаснай рускай літаратурнай мовы» (т. 1—17, 1948—65), «Слоўнік рускай мовы» (т. 1—4, 1981—84).

Першы на Беларусі акад. даведнік такога тыпу — *«Тлумачальны слоўнік беларускай мовы»* (т. 1—5, 1977—84). У 1966 выйшаў «Тлумачальны слоўнік беларускай мовы: Для сярэдняй школы» А.Я.Баханькова, І.М.Гайдукевіча і П.П.Шубы (3-е выд., 1979), у якім тлумачацца значэнні каля 6 тыс. слоў, што выкарыстоўваюцца ў вучэбнай і маст. л-ры. У 1996 выдадзены «Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы» пад рэдакцыяй М.Р.Судніка і М.Н.Крыўко, які змяшчае больш за 65 тыс. слоў. Т.с. ўзніклі на аснове перакладных, дзе значэнне слоў раскрываецца шляхам перакладу на інш. мову. Некат. ранейшыя бел. слоўнікі спалучаюць асаблівасці тлумачальных і перакладных. Найб. значны з іх — «Слоўнік беларускай мовы» І.І.Насовіча (1870, факсімільна перавыдадзены ў 1983), дзе адлюстравана нар. бел. лексіка сярэдзіны 19 ст. Т.с. можа ўключаць лексіку твораў толькі пэўнага пісьменніка (гл. *Слоўнік мовы пісьменніка*).

П.У.Сцяцко.

«ТЛУМАЧА́ЛЬНЫ СЛО́ЎНІК БЕЛАРУ́СКАЙ МО́ВЫ», першы ў гісторыі бел. лексікаграфіі. Створаны ў Ін-це мовазнаўства АН Беларусі пад агульнай рэд. К.К.Атраховіча (Кандрата Крапівы). Выдадзены ў 5 тамах у 1977—84 выд-вам «Беларуская Энцыклапедыя». Тлумачыць значэнні слоў і фразеалагічных зваротаў, вызначае іх унармаванае ўжыванне, вымаўленне і напісанне. Яго асн. задачы — адлюстраванне лексікасемантычнага стану бел. літ. мовы ад пач. 20 ст. да 1970-х г., садзейнічаць далейшай нармалізацыі бел. літ. мовы і павышэнню маўленчай культуры бел. народа, служыць крыніцай для даследчыкаў пры вывучэнні лексічных сродкаў блізкіх па паходжанні моў. У ім змешчана больш за 105 тыс. слоў, фразеалагічных і тэрміналагічных выразаў. Лексічны матэрыял падаецца ў алфавітным парадку. Уключаны тэрміны, што ўвайшлі ў падручнікі сярэдняй агульнаадукацыйнай школы або часта ўжываюцца ў перыяд. друку і навук.-папулярнай л-ры; агульнаўжывальная лексіка і фразеалогія, якая выкарыстоўваецца ва ўсіх жанрах і стылях сучаснай бел. літ. мовы; новыя словы, засвоеныя шырокім колам грамадскасці; іншамоўныя словы, архаізмы і гістарызмы. Кожнае слова забяспечана грамат., стылістычнай і акцэнталагічнай характарыстыкамі, ілюстрацыйным матэрыялам (цытатамі з маст., навук. і публіцыстычнай л-ры). Да слоў іншамоўнага паходжання даюцца этымалагічныя даведкі. Не даюцца ўстарэлыя і вузкадыялектныя словы, індывідуальныя неалагізмы, складаныя прыметнікі (што пішуцца праз злучок), прыслоўі з прыстаўкай «па-», літарныя абрэвіятуры.



«Тлумачальны слоўнік беларускай мовы».

М.Р.Суднік.

ТЛУМАЧЭ́ННЕ ЗАКО́НА, дзейнасць органаў дзяржавы, арганізацый, устаноў, службовых асоб і грамадзян, накіраваная на асэнсаванне і тлумачэнне сэнсу і зместу *норм права*. Ажыццяўляецца ў працэсе праватворчасці, рэалізацыі юрыд. норм суб'ектамі права, у навук. дзейнасці і выкладанні юрыд. дысцыплін. Мэта Т.з. — дакладнае і аднастайнае выкарыстанне законаў, выдаленне малазразумелых месц і магчымых памылак пры іх рэалізацыі. Т.з. падзяляюць на: тэкставае (аналіз знешняй формы нормы і яе тэксту), сістэматычнае (устанаўленне сувязей і ўзаемазалежнасцей тлумачанай нормы з блізкімі паводле зместу нормамі, вызначэнне месца, якое яна займае ў структуры нарматыўнага акта), гісторыка-палітычнае (даследаванне сац. значэння нормаў, іх мэт, намераў заканадаўцаў, грамадска-паліт. абставін, якія абумовілі выданне нормы). Пры ўзнікненні разыходжанняў паміж зместам нормы і яе вонкавым афармленнем, выкарыстоўваюць пашыранае Т.з., калі сапраўдны змест нормы некалькі шырэйшы, чым яго слоўны выраз, або абмежаванае, калі ён разумеецца вузей, чым гэта прама выказана ў фармулёўцы нормы. Вылучаюць Т.з. афі-



Тлі: 1 — бульбяная вялікая; 2 — лісцевая галавая; 3 — бурачная; 4 — агрэставая (а — самец; б — самка).

цыйнае (робіцца спец. ўпаўнаважанымі органамі ў афіц. акце і з'яўляецца абавязковай дырэктывай для выканаўцаў) і неафіцыйнае, або дактрынальнае (у форме рэкамендацый і парад, што даюцца грамадскімі арг-цыямі, навук. ўстановамі, вучонымі і практыкамі). Афіцыйнае Т.з. ў сваю чаргу падзяляецца на нарматыўнае і казуальнае. Нарматыўнае Т.з. абавязковае для ўсіх асоб і органаў і пашыраецца на ўсе выпадкі, прадугледжаныя нормай; казуальнае — афіц. тлумачэнне нормы, якое даецца судовым або інш. кампетэнтным органам у сувязі з разглядам пэўнай справы і абавязкова выключна пры яе разглядзе.

Ю.Я.Савельеў.

ТЛУ́СТЫЯ КІСЛО́ТЫ, аліфатычныя *карбонавыя кіслоты*; асн. структурны кампанент многіх *ліпідаў*. Паводле ступені насычанасці вуглевадароднага радыкала адрозніваюць Т.к. насычаныя (гранічныя) і ненасычаныя (негранічныя), ніжэйшыя, сярэднія і вышэйшыя (па колькасці вугляродных атамаў). У прыродзе пераважна сустракаюцца вышэйшыя Т.к. з цотнай лічбай атамаў вугляроду (C_{14}—C_{24}). У жывых арганізмах Т.к. — пластычны і энергет. матэрыял; знаходзяцца ў свабодным і звязаным выглядзе; паступаюць з ежай і сінтэзуюцца ў клетках пераважна шляхам паслядоўнага далучэння або адшчаплення двухвугляродных фрагментаў. Пры працяглай адсутнасці ў ежы ненасычаных Т.к. у жывёл назіраецца адставанне ў росце, пашкоджанні скуры, валасянога покрыва. Лішак насычаных Т.к. садзейнічае павелічэнню колькасці халестэролу ў крыві. Свабодныя Т.к. ў тканках маюцца ў невял. канцэнтрацыях, яны — прамежкавыя прадукты пры сінтэзе і распадзе інш. ліпідаў. Гл. таксама *Незаменныя тлустыя кіслоты, Пальміцінавая кіслата, Стэарынавая кіслата.*

Літ.: Кучеренко Н.Е., Васильев А.Н. Липиды. Киев, 1985; Ленинджер А. Основы биохимии: Пер. с англ. Т. 1—3. М., 1985; Березов Т.Т., Коровкин Б.Ф. Биологическая химия. 3 изд. М., 1998.

І.М.Семяненя.

ТЛУ́ШЧАВАЯ ТКА́НКА, разнавіднасць *злучальнай тканкі* жывёльнага арганізма. Складаецца з клетак, якія ўтрымліваюць у цытаплазме тлушчавыя ўключэнні. Служыць энергет. дэпо арганізма, засцерагае яго ад страты цяпла. У пазваночных жывёл і чалавека размешчана пераважна пад скурай (падскурная клятчатка), у сальніку, паміж унутр. органамі ў выглядзе мяккіх, пруткіх пракладак. У водных млекакормячых (напр., у некат. кітоў) слой падскурнай Т.т. дасягае 50 см.

ТЛУШЧАВІ́К, дабраякасная пухліна, тое, што *ліпома*.

ТЛУ́ШЧАВЫ АБМЕ́Н, ліпідны абмен, сукупнасць працэсаў пераўтварэнняў *тлушчаў* у арганізме чалавека і жывёл. Уключае ператраўліванне і ўсмоктванне тлушчаў і прадуктаў іх распаду ў страўнікава-кішачным тракце, прамежкавы Т.а., выдаленне з арганізма. *Ліпіды* забяспечваюць да 40% агульнай колькасці калорый, выконваюць пластычную функцыю пабудовы мембран клетак і інш. Найб. важныя ліпіды — трыацылгліцэролы (ТАГ) або нейтральныя тлушчы. Расшчапленне тлушчаў расл. і жывёльнага паходжання ў дарослых людзей пачынаецца ў кішэчніку (у грудных дзяцей у страўніку). Пад уплывам *жоўці* адбываецца эмульгаванне тлушчаў і актывацыя *ліпазы*. ТАГ расшчапляюцца да ды-, манагліцэрыдаў, гліцэрыны і *тлустых кіслот*. 25—30% эмульгаваных тлушчаў усмоктваецца кішэчнікам і пераходзіць у кроў без змены. Тлустыя к-ты ўсмоктваюцца ў комплексе з жоўцевымі к-тамі. Частка гліцэрыны і тлустых к-т у слізістай абалонцы кішэчніка ідзе на рэасінтэз тлушчаў, астатняя пераходзіць у кроў і лімфу.

Прамежкавы Т.а. уключае расшчапленне ТАГ у тканках з утварэннем вышэйшых тлустых к-т і гліцэрыны, мабілізацыю тлустых к-т з тлушчавых дэпо, іх акісленне, утварэнне кетонавых цел, біясінтэз вышэйшых тлустых к-т і інш. Тлустыя к-ты паступаюць у органы і тканкі, далей акісляюцца ў цыкле трыкарбонавых к-т. Каля 30% тлустых к-т затрымліваецца ў печані пры аднаразовым праходжанні праз яе. У печані ўтвараюцца *ліпапратэіды* розных шчыльнасці, якія ўдзельнічаюць у Т.а. ўсіх органаў і тканак. Сінтэз ТАГ ажыццяўляецца гал. чын. у тлушчавай тканцы, печані, сценцы кішэчніка. Асн. шлях выдалення тлушчу — праз скуру з сакрэтамі сальных і потавых залоз, невял. ч. — з фекаліямі, мачой. Т.а. узмацняецца пры фіз. нагрузцы, галаданні, ахаладжэнні і інш. стрэсавых уздзеяннях.

Літ.: Кучеренко Н.Е., Васильев А.Н. Липиды. Киев, 1985; Липовецкий Б.М. Клиническая липидология. СПб., 2000.

І.М.Семяненя.

ТЛУ́ШЧАВЫЯ ЗАЛО́ЗЫ, скурныя залозы жывёл і чалавека, якія выдзяляюць скурны тлушч, што ахоўвае скуру і валасы ад высыхання. Развіваюцца з эпітэлію валасяных фалікулаў, размешчаны па ўсёй скуры. У чалавека Т.з. найб. насычана скура валасістай ч. галавы, шчок, падбародка (400—900 на 1 $см^2$). Сакрэт Т.з. забяспечвае эластычнасць і непранікальнасць скуры для вады, некат. мікраарганізмаў, хім. рэчываў і інш. Сакрэт Т.з. некат. жывёл мае характэрны пах (гл. *Мускусныя залозы*); у кітападобных Т.з. прадстаўлены спецыфічнай анальнай залозай. Функцыі Т.з. рэгулююцца палавымі гармонамі. У самцоў Т.з. буйнейшыя, чым у самак, выдзяляюць больш сакрэту. Захворванні Т.з. чалавека — *атэрома, вугры, себарэя.*

А.С.Леанцюк.

ТЛУШЧАМАЛО́ЧНАСЦЬ, адносна ўстойлівая, спадчынная селекцыйная прыкмета с.-г. жывёл, колькасць тлушчу ў іх *малацэ*. Залежыць ад відавых, пародных, індывід. асаблівасцей, зоны развядзення, умоў утрымання, пары года, спосабаў *даення* і інш. З узростам жывёлы Т. мяняецца нязначна. Сярэдняя колькасць тлушчаў у малацэ кароў 3,9%, коз 4,3%, авечак 7,2%, свіней 5,9%, буйвалаў 7,7%, вярблюдаў 5%, коней 1,8%, асліц 1,7%, паўн. аленяў 18,7%. Сярод буйн. раг. жывёлы Т. найб. высокая ў джэрсейскай (5—7%), найб. нізкая ў чорна-пярэстай (3,75%) парод. Паляпшаюць Т. скрыжаваннем кароў з нізкай Т. і быкоў тлушчамалочных парод. Асн. крыніца ўтварэння малочнага тлушчу — кармы з вял. колькасцю лёгказасваяльных вугляводаў (крухмалу, цукроў), з дастатковай колькасцю бялку, тлушчаў, мінер. рэчываў, вітамінаў.

ТЛУШЧА́НКА (Pinguicula), род кветкавых раслін сям. плывунцовых. Каля 45 відаў. Пашыраны ў нетрапічных паясах Паўн. паўшар'я. Растуць у вільготных месцах. На Беларусі 1 від — Т. звычайная (P. vulgaris), занесеная ў Чырв. кнігу. Трапляецца на мохавых нізінных балотах і забалочаных лугах.

Шматгадовыя травяністыя *насякомаедныя расліны* выш. да 20 см. Лісце ў прыкаранёвай разетцы, суцэльнае, сульцэльнакрайняе, ільснянае, нібы змазанае тлушчам (адсюль назва). На лісці галоўчатыя залозкі 2 тыпаў; адны пакрытыя ліпкай вадкасцю для прынаджвання і лоўлі насякомых, другія — выдзяляюць пратэалітычныя ферменты, якія ператраўліваюць бялкі насякомых. Кветкі двухполыя, няправільныя, адзіночныя, на верхавінцы кветаноснай стрэлкі, жоўтыя, блакітныя, сіне-фіялетавыя, ружовыя. Плод — каробачка. Лісце Т. выкарыстоўваюць для скісання малака. Лек. і дэкар. расліны.

А.М.Скуратовіч.

ТЛУШЧАПО́Т воўны, сумесь выдзяленняў тлушчавых і потавых залоз скуры авечак. Захоўвае воўну ад уздзеяння вільгаці, мех. забруджвання і інш., спрыяе лепшаму захаванню фіз.-хім. уласцівасцей воўнавых валокнаў. У воўне мерыносавых авечак 30—40% Т., паўтанкарунных 12—20%, грубашэрсных каля 4%. Пры недахопе Т. воўна робіцца сухой, страчвае бляск; пры лішку — памяншаецца выхад чыстай воўны. Т. выкарыстоўваюць для атрымання *ланаліну*.

ТЛУШЧАХВО́СТЫЯ АВЕ́ЧКІ, група парод авечак, якія маюць тлушчавыя адклады ў хвасце. Паводле даўж. і формы хваста Т.а. падзяляюцца на кароткатлушчахвостых (бурацкая, мангольская, кулундзінская і інш. грубашэрсныя пароды Сібіры) і доўгатлушчахвостых (*каракульская парода*, грузінская танкарунная, кучугаўская, асецінская, балбас, карачаеўская, валошская, тушынская і інш.). Тлушчавыя адклады ў хвасце — рэзервовая крыніца жыўлення авечак у перыяды недахопу кармоў зімой і піцця летам, таксама дадатковая крыніца мясной прадукцыі.

ТЛУ́ШЧЫ, рэчывы расліннага (тлустыя *алеі*) або жывёльнага паходжання, якія складаюцца пераважна з трыгліцэрыдаў — поўных *эфіраў* гліцэрыны і тлустых кіслот. Агульная ф-ла трыгліцэрыдаў $R'OCOCH_2—CH(OCOR'')—CH_2OCOR'''$, дзе R',R'',R''' — радыкалы тлустых кіслот. У састаў Т. уваходзяць трыгліцэры-

ды неразгалінаваных насычаных, а таксама мона- і поліненасычаных тлустых кіслот з цотным (ад 4 да 26) лікам атамаў вугляроду. Т. маюць таксама ды- і монагліцэрыды (1—3%; гл. *Гліцэрыды*), фосфаліпіды, глікаліпіды і дыольныя ліпіды (0,5—3%), свабодныя тлустыя к-ты, стэрыны і іх эфіры (0,05—1,7%), вітаміны A, D, E і K. Разам з вугляводамі і бялкамі Т. ўваходзяць у састаў жывёльных і раслінных арганізмаў (гл. *Тлушчавы абмен*).

Жывёльныя Т. — цвёрдыя або вадкія рэчывы, шчыльн. 900—970 кг/м^3. Цвёрдыя Т. ёсць у тканках наземных млекакормячых і птушак, вадкія — у тканках марскіх млекакормячых і рыб, а таксама ў касцях і капытах наземных жывёл. У састаў цвёрдых Т. уваходзяць пераважна трыгліцэрыды насычаных кіслот (пальміцінавай $C_{15}H_{31}COOH$ і стэарынавай $C_{17}H_{35}COOH$) і монаненасычанай $C_{17}H_{33}COOH$ алеінавай к-ты. Вадкія Т. маюць значную колькасць трыгліцэрыдаў поліненасычаных кіслот. Т. плавяцца ў інтэрвале т-р (напр., для свінога Т. $t_{пл}$22—48 °С, для барановага — 44—55 °С), кіпяць з раскладаннем у высокім вакууме (пры ціску ~0,1 Па $t_{кіп}$~250 °С). Раствараюцца ў большасці арган. растваральнікаў; у вадзе не раствараюцца, утвараюць з ёй устойлівыя эмульсіі (напр., *малако*). Пры дзеянні перагрэтай вадзяной пары, мінер. кіслот і ферментаў Т. гідралізуюцца з утварэннем *гліцэрыны* і свабодных *тлустых кіслот*, пры дзеянні шчолачаў — амыляюцца (гл. *Амыленне*); па падвойных сувязях ненасычаных кіслот далучаюць вадарод (гл. *Гідрагенізацыя*), галагены і інш. Атрымліваюць Т. вытопліваннем з сала-сырцу пераважна сухім (бязводны) ці мокрым (у прысутнасці гарачай вады пад ціскам) спосабамі. Выкарыстоўваюць жывёльныя Т. як харч. прадукты і сыравіну для атрымання такіх прадуктаў, у вытв-сці мыла і мыйных сродкаў, тлустых кіслот, гліцэрыны, касметычных сродкаў, змазачных матэрыялаў, як дабаўкі да высыхальных алеяў у вытв-сці пакостаў і алкідных смол, у медыцыне (крыніца вітаміну А) і сельскай гаспадарцы (падкормка для жывёл).

Літ: Беззубов Л.П. Химия жиров. 3 изд. М., 1975; Технология переработки жиров. М., 1985. *Я.Г.Міляшкевіч.*

ТМУТАРАКА́НСКАЕ КНЯ́СТВА, старажытнарускае ўдзельнае княства ў 10—12 ст. на тэр. Таманскага і, верагодна, ч. Керчанскага п-авоў (цяпер тэр. Расіі і Украіны) з цэнтрам у г. *Тмутаракань*. Усх.-слав. насельніцтва тут магло з'явіцца пасля паходаў кіеўскіх князёў *Ігара* (944) на *Візантыю* і *Святаслава Ігаравіча* (965) на аланаў і адыгаў. Упершыню згадваецца ў летапісах пад 988. Да 1036 належала кн. *Мсціславу Уладзіміравічу*, пазней чарнігаўскаму кн. Святаславу Яраславічу (1026—76) і яго нашчадкам, было аб'ектам дамаганняў інш. рус. князёў і Візантыі. У канцы 11 — пач. 12 ст. пад націскам *полаўцаў* страціла сувязь з інш. землямі Кіеўскай Русі і спыніла існаванне.

ТМУТАРАКА́НЬ, старажытнарускі горад, верагодна, на Таманскім п-ве каля станіцы Таманскай Краснадарскага краю (Расія). У 6 ст. на гэтым месцы існаваў ант. горад Германаса, у 8—9 ст. — паселішча Таматарха, падпарадкаванае *Хазарскаму каганату*. Пасля разгрому каганата ў 965 кіеўскім кн. Святаславам Ігаравічам, магчыма, тут узнікла Т., якая стала цэнтрам *Тмутараканскага княства*. Тут жылі касогі, грэкі, аланы, славяне і армяне. У 1023 кн. *Мсціслаў Уладзіміравіч* пабудаваў у Т. царкву Багародзіцы. У канцы 11 ст. Т. захапілі полаўцы, потым Візантыя, у 13 ст. — генуэзцы, пазней — Залатая Арда; у 15 ст. на гэтым месцы існавала генуэзская калонія Матрэга, якую ў 1475 разбурылі тур. войскі.



Тлушчанка: 1 — звычайная; 2 — лузітанская.

«ТОВА́РИЩ», грамадска-палітычная газета Партыі камуністаў Беларускай (ПКБ). Выдаецца са снеж. 1994 у Мінску на бел. і рус. мовах штотыднёва. Асвятляе дзейнасць ПКБ, міжнар. камуніст., рабочага і нац.-вызв. руху, пытанні грамадска-паліт., сац.-эканам. і культ. жыцця краіны. Мае рубрыкі: «Партыйнае жыццё», «У братэрскіх партыях», «Падзеі і факты», «Эканоміка», «Народ і ўлада», «Весці рэгіёнаў», «Старонкі гісторыі» і інш. Штоквартальна выходзяць спец. тэарэт. «Палітычны дыялог» і маладзёжны выпускі. *С.В.Вазняк.*

ТО́ГА (лац. toga ад tego накрываю), верхняе адзенне грамадзян Стараж. Рыма — кавалак белай шарсцяной тканіны эліпсападобнай формы, якая драпіравалася вакол цела.

ТО́ГА (Togo), Тагалезская Рэспубліка (République Togolaise), дзяржава ў Зах. Афрыцы, на ўзбярэжжы Гвінейскага заліва. Мяжуе на З з Ганай, на Пн з Буркіна-Фасо, на У з Бенінам. Пл. 56,8 тыс. км^2. Нас. 5018,5 тыс. чал. (2000). Дзярж. мова — французская. Сталіца — г. *Ламе*. Падзяляецца на 5 абласцей. Нац. свята — Дзень незалежнасці (27 крас.).

Дзяржаўны лад. Т. — рэспубліка. Дзейнічае канстытуцыя 1992. Кіраўнік дзяржавы — прэзідэнт, які выбіраецца ўсеагульным і прамым галасаваннем на 5 гадоў. Ён таксама з'яўляецца галоўнакамандуючым узбр. сіламі, валодае правам заканад. ініцыятывы і можа распускаць парламент. Выканаўчую ўладу ажыццяўляюць прэзідэнт і ўрад. Кіраўнік урада — прэм'ер-міністр, якога назначае прэзідэнт. Заканадаўчую ўладу ажыццяўляе аднапалатны Нац. сход (81 дэпутат, выбіраецца на 4 гады).

Прырода. У рэльефе пераважаюць слабахвалістыя раўніны і плато выш. 200—400 м, у цэнтры і на ПдЗ — горы выш. да 986 м, на Пд — прыморская акумуляцыйная нізіна з лагунамі. Карысныя выкапні: фасфарыты, баксіты, алмазы, жал. і хромавыя руды, вапнякі, мармур. Клімат субэкватарыяльны, на ўзбярэжжы з 2 максімумамі (сак.—чэрв. і вер.—кастр.) і 2 мінімумамі ападкаў, у глыбіні краіны з дажджлівым летнім (крас.—кастр.) і сухім зімовым сезонамі. Сярэднямесячныя т-ры ад 20 да 32 °С. Ападкаў 750—1500 мм за год. Зімой часта дзьме сухі паўн.-ўсх. вецер харматан. Рэкі багатыя гідраэнергіяй. Пераважаюць высакатраўныя саванны. Лясы (20% тэр.) на схілах гор і ў далінах рэк. У складзе жывёльнага свету буйвал, леў, леапард, жыраф, антылопы, шакал, гіены, малпы, кракадзілы. Нац. паркі — Керан, Кве; рэзерваты.

Насельніцтва. Т. — шматнацыянальная краіна. Афр. народы складаюць 99%. Найб. з іх — эве (каля 50% насельніцтва разам з блізкімі народамі, на Пд), кабрэ (на ПнУ), гурма і тэм (на Пн). У гарадах невял. колькасць фран-

цузаў і арабаў. Сярод вернікаў 70% прытрымліваецца традыц. вераванняў, 20% хрысціян, 10% мусульман. Сярэднегадавы прырост 2,7% (2000). Сярэдняя шчыльн. 88,4 чал. на 1 км^2. Найб. шчыльна (да 500 чал. на 1 км^2) заселены асобныя раёны ўзбярэжжа і ПнУ. У гарадах жыве 32% насельніцтва (1998). Найб. гарады: Ламе (каля 600 тыс. ж. з прыгарадамі; 2000), Сакодэ і Кпаліме (каля 50 тыс. ж.). У сельскай гаспадарцы занята 66% эканамічна актыўнага насельніцтва, у прам-сці — 10%, у абслуговых галінах — 24%.

Гісторыя. У сярэдзіне 15 ст. на ўзбярэжжы Ґ. з'явіліся партугальцы. Да сярэдзіны 19 ст. тэр. Т. — адзін з раёнаў найб. інтэнсіўнага гандлю рабамі. На момант еўрап. каланізацыі ў канцы 19 ст. найб. развітым з народаў Т. былі эве, якія стварылі на Пд шэраг дзярж. утварэнняў. Існавалі і дзярж. ўтварэнні катаколі — у цэнтры краіны і чакосі — на Пн. У 1884 Германія навязала пратэктарат эве, а да 1902 распаўсюдзіла сваю ўладу на ўсю тэр. Т. У 1-ю сусв. вайну тэр. Т. акупіравана брыт. і франц. войскамі (1914). *Версальскі мірны дагавор 1919* замацаваў зах. Т. за Вялікабрытаніяй (у 1957 далучана да Рэспублікі Гана), усх. Т. — за Францыяй у якасці падмандатных тэрыторый Лігі Нацый. Пасля 2-й сусв. вайны Франц. Т. — падапечная тэр. ААН пад кіраваннем Францыі. З 1956 Франц. Т. — самакіравальная рэспубліка ў складзе Франц. супольнасці.

27.4.1960 абвешчана незалежнасць Тагалезскай Рэспублікі. Партыя адзінства Т. (ПАТ) на чале з С.Алімпіо, якая ўзначаліла ўрад Т., спрабавала стварыць аднапартыйны рэжым, у 1962 забараніла ўсе апазіцыйныя партыі. У выніку ваен. перавароту ў 1963 урад ПАТ скінуты, а Алімпіо забіты. Прэзідэнтам стаў Н.Груніцкі, які спрабаваў ажыццявіць дэмакр. рэформы. Новы ваен. пераварот у 1967 прывёў да ўлады падпалкоўніка Г.Эядэму (з 1972 — прэзідэнт Т.), які ўсталяваў жорсткі аўтарытарны рэжым; адзінай дазволенай партыяй было Аб'яднанне тагалезскага народа. Выступленні апазіцыі прымусілі Эядэму ў 1991 дазволіць шматпартыйнасць, што не перашкодзіла яго абранню прэзідэнтам у 1993 і 1998. Т. — чл. ААН (з 1960), Афр. саюза. У Т. дзейнічаюць паліт. партыі: Аб'яднанне тагалезскага народа, Саюз за змены і інш.

Гаспадарка. Т. ўваходзіць у групу найбяднейшых краін свету і па класіфікацыі ААН займае 140-е месца паводле паказчыкаў сац.-эканам. развіцця. Валавы ўнутр. прадукт у разліку на 1 чал. 320 дол. за год (1999). Каля 42,2% яго ствараецца ў сельскай гаспадарцы, лесаводстве, рыбалоўстве, паляўніцтве, каля 30,9% — у прам-сці, будаўніцтве, энергетыцы, транспарце і сувязі, каля 17,8% — у гандлі і турызме, 9,1% — у інш. абслуговых галінах. Урад праводзіць мерапрыемствы па ўзмацненні ролі дзяржавы ў эканоміцы. Дзяржава кантралюе б.ч. транспарту, вытв-сць электраэнергіі, здабычу фасфарытаў і інш. Адначасова прыцягваецца замежны (пераважана франц.) капітал. Сельская гаспадарка — асн. галіна эканомікі. Пераважаюць паўнатуральныя і дробнатаварныя гаспадаркі да 1—2 га. Ёсць плантацыі экспартных культур. У сельскай гаспадарцы выкарыстоўваецца каля



Герб і сцяг **Тога**.

3,4 млн. га зямлі, у т.л. каля 1,4 млн. га пад ворывам і шматгадовымі насаджэннямі, каля 2 млн. га пад натуральнай пашай (саванны). Вытв-сць асн. харч. культур (1997/98, тыс. т): маніёку — 595,8, батату — 683, кукурузы — 452,8, сорга — 200,5, рысу — 86,2, бабовых — 46,7. Вырошчваюць таксама проса, ямс, агародніну. Трапічнае садоўніцтва. Гал. экспартныя культуры (штогадовы збор, тыс. т): арахіс — каля 40, кава — каля



6, какава — каля 15, бавоўна-сырэц — каля 45, ядры пальмавых арэхаў — каля 5. Жывёлагадоўля экстэнсіўная, малатаварная, развіта ў раёнах, дзе няма мухі цэцэ. Пагалоўе (1997, тыс. галоў): буйн. раг. жывёлы 222,8, свіней 850, коз 1110, авечак 740. Птушкагадоўля (7,5 млн. курэй). Буйн. раг. жывёлу гадуюць пераважна на Пн, свіней — на Пд. Рыбалоўства ва ўнутр. вадаёмах і моры (каля 10 тыс. т штогод). Паляўніцтва. У прам-сці пераважаюць дробныя прадпрыемствы. Вылучаецца горназдабыўная прам-сць, пераважна здабыча фасфарытаў (на Пд каля г. Акумапе, штогод каля 3 млн. т, 5—6-е месца ў свеце). Здабываюць таксама алмазы, кухонную соль (з марской вады), жал. руду, мармур, буд. матэрыялы. Каля 75% электраэнергіі імпартуецца з Ганы. У 1999 атрымана 90 млн. кВт·гадз электраэнергіі, у т.л. 93% на цеплавых электрастанцыях, 7% на ГЭС. У апрацоўчай прам-сці дробныя прадпрыемствы па вытв-сці мукі, пальмавага і арахісавага алею, крухмалу і мукі з маніёку, безалкагольных напіткаў, парфумерных тавараў; саматужныя прадпрыемствы па ачыстцы бавоўны, першаснай апрацоўцы кавы і какавы. Ёсць некалькі значных прадпрыемстваў: нафтаперапр. з-д (Ламе), тэкст. ф-ка (Даджа), з-ды па вытв-сці лакаў і фарбаў, мыйных сродкаў, кіслароду і ацэтылену, зборцы веласіпедаў і мапедаў, абутковая і запалкавая ф-кі. Развіты саматужныя промыслы: выраб нац. адзення і абутку, хатніх рэчаў, простага с.-г. інвентару, сувеніраў з дрэва і слановай косці, ткацтва, пляценне і ганчарства. Шматлікія паўсаматужныя прадпрыемствы па першаснай апрацоўцы с.-г. сыравіны, вытв-сці харч. прадуктаў. Харч. тавары, напіткі і тытунёвыя вырабы складаюць 41,1% прамысл. прадукцыі. Транспарт чыг., аўтамаб., марскі. Даўж. (тыс. км,



Да арт. **Тога**. Вёска на Пн краіны.

1996): чыгункі 0,5, аўтадарог 7,5, у т.л. з цвёрдым пакрыццём 2,4. У краіне 74,7 тыс. легкавых, 34,6 тыс. грузавых аўтамабіляў і аўтобусаў. Асн. парты Ламе і Кпеме (экспарт фасфарытаў). Праз порт Ламе ажыццяўляе значную частку сваіх знешнегандл. сувязей Буркіна-Фасо. У Т. 17 аэрапортаў, у т.л. міжнар. каля Ламе і Ніямтугу. У 1999 экспарт склаў 400 млн. дол., імпарт — 450 млн. дол. У экспарце пераважаюць фасфары-

ты (каля 40%), кава (каля 5%), бавоўна, какава, пальмавы алей, арахіс; у імпарце — спажывецкія і харч. тавары, абсталяванне і трансп. сродкі, нафта. Гал. гандл. партнёры: Францыя, Гана, Канада, Кітай. Эканоміка залежыць ад знешняй фін. і тэхн. дапамогі развітых дзяржаў. Турызм. Грашовая адзінка — франк Афрыканскага фін. т-ва.

ТОД (Todd) Аляксандэр (2.10.1907, г. Глазга, Вялікабрытанія — 10.1.1997), англійскі хімік-арганік. Чл. Лонданскага каралеўскага т-ва (1942), у 1975—80 яго прэзідэнт. Замежны чл. АН СССР (1982). Вучыўся ва ун-тах г. Глазга, Франкфурта-на-Майне і Оксфардскім ун-це. З 1938 праф. Манчэстэрскага, у 1944—71 — Кембрыджскага ун-таў. У 1952—64 старшыня ўрадавага Кансультатыўнага савета Вялікабрытаніі па навук. палітыцы. Навук. працы па хіміі нуклеатыдаў, нуклеатыдных кафермента ў і нуклеінавых кіслот. Устанавіў асн. прынцып хім. будовы рыбануклеінавых кіслот (1953). Ажыццявіў першы сінтэз дынуклеатыда (1955). Нобелеўская прэмія 1957.

ТО́ЕСНАЕ ПЕРАЎТВАРЭ́ННЕ, замена аднаго аналітычнага выразу іншым, тоесна яму роўным, але адрозным па форме (гл. *Тоеснасць*).

Мэта Т.п. — наданне выразу выгляду, больш зручнага для лікавых разлікаў ці далейшых пераўтварэнняў, для лагарыфмавання, дыферэнцавання, інтэгравання, рашэння ўраўненняў і інш. Да Т.п. адносяцца, напр., прывядзенне падобных членаў, раскрыццё дужак, раскладанне на множнікі, прывядзенне алг. дробаў да аднаго назоўніка і інш.

ТО́ЕСНАСЦІ ЗАКО́Н, адзін з асн. законаў фармальнай *логікі*, згодна з якім кожнае завершанае *суджэнне* ў лагічных аперацыях пры паўтарэнні павінна мець аднолькавы, устойлівы змест; прынцып правільнай пабудовы думак у працэсе разважання. Сфармуляваны Арыстоцелем, які сцвярджаў, што абмеркаванне пэўнай праблемы павінна пачынацца з вызначэння агульнага сэнсу паняццяў, якімі карыстаюцца субяседнікі. У логіцы Т.з. сімвалічна выяўляецца ў выглядзе формулы А ёсць А, ці А=А, у матэм. логіцы — $A \to A$, дзе А — пэўнае выказванне, а $\to$ — знак імплікацыі. На практыцы Т.з. прадугледжвае пэўнае абстрагаванне ад характару аб'ектаў выказвання, ад іх развіцця і змены, што правамоцна ў сувязі з адноснай устойлівасцю ўсіх з'яў. Т.з. дапаўняецца і развіваецца *супярэчнасці законам* і *выключанага трэцяга прынцыпам*. *В.М.Пешкаў.*

ТО́ЕСНАСЦІ ПРЫ́НЦЫП, фундаментальны прынцып квантавай механікі, паводле якога *тоесныя часціцы* пры квантавамех. апісанні іх станаў лічацца прынцыпова неадрознымі.

Гэта азначае, што станы фіз. сістэмы, якія адрозніваюцца перастаноўкамі тоесных часціц, лічацца адным станам; у адрозненне ад класічнай механікі, дзе за кожнай часціцай можна прасачыць па яе траекторыі, у квантавай механіцы паняцце траекторыі адсутнічае і тоесныя часціцы страчваюць сваю індывідуальнасць. З Т.п. вынікае, што сістэма тоесных *базонаў* павінна апісвацца поўнасцю сіметрычнымі (адносна перастановак каардынат і спінавых пераменных), а сістэма тоесных *ферміёнаў* — поўнасцю антысіметрычнымі *хвалевымі функцыямі*. З Т.п. вынікае таксама існаванне ў сістэмах тоесных часціц спецыфічных квантава-мех. абменных эфектаў, напр., *абменнага ўзаемадзеяння*. *А.А.Богуш.*



А.**Тод**.



А.А.**Тозік**.

ТО́ЕСНАСЦЬ, гранічная роўнасць аб'ектаў, поўнае супадзенне іх родавых і індывідуальных уласцівасцей; захаванне прадметам ці з'явай адных і тых жа ўстойлівых уласцівасцей. Цесна звязана з катэгорыяй адрознення: вызначэнне пэўных прадметаў як тоесных патрабуе выяўлення іх адрознення ад нятоесных. У сувязі з пастаяннай зменлівасцю рэчаіснасці мае адносны, часовы характар. Паняцце «Т.» выкарыстоўваюць у філасофіі, логіцы, матэматыцы (гл. *Тоеснасць* у матэматыцы). Адрозніваюць м е т а ф і з і ч н а е тлумачэнне Т., якое разглядае яе як вечную і нязменную роўнасць прадмета з самім сабой, і д ы я л е к т ы ч н а е, якое не выключае змену прадмета. Вылучаюць прынцыпы Т. а б с а л ю т н а й (не прадугледжвае ўзнікнення адрозненняў паміж прадметамі), а б с т р а к т н а й (заснаваны на часовым абстрагаванні ад адрозненняў прадметаў) і к а н к р э т н а й (разглядае Т. у адзінстве з адрозненнямі прадметаў). Т. выяўляецца пры разглядзе рэчаў саміх па сабе і ў адносінах да інш. рэчаў, форм мыслення (гл. *Тоеснасці закон*), узаемаадносін адлюстравання і адлюстравальнага. *Н.Г.Кісялёва.*

ТО́ЕСНАСЦЬ у м а т э м а т ы ц ы, роўнасць двух аналітычных выразаў, справядлівая пры любых дапушчальных значэннях пераменных.

Прыклады Т.: 1) $(a+b)^2 = a^2+2ab+b^2$ пры ўсіх лікавых значэннях a і b; 2) $\log xy=\log x+\log y$ пры ўсіх дадатных значэннях x і y; 3) $1+\operatorname{tg}^2 x = 1/\cos^2 x$ пры $x \neq \frac{\pi}{2}(2k+1)$, дзе k — любы цэлы лік. Для абазначэння Т. выкарыстоўваецца знак $\equiv$, уведзены Г.Ф.Б.*Рыманам* (1857).

ТО́ЕСНЫЯ ЧАСЦІ́ЦЫ, часціцы (*ферміёны* і *базоны*), якія пры квантава-мех. апісанні характарызуюцца аднолькавымі масамі, электрычнымі зарадамі, спінамі і інш. квантавымі лікамі. Напр., усе *пратоны* Сусвету лічацца тоеснымі. Усе Т.ч. падпарадкоўваюцца *тоеснасці прынцыпу*, а ферміёны — таксама і *Паўлі прынцыпу*.

ТО́ЗІК Анатолій Афанасьевіч (н. 13.3.1949, в. Казанск Калінкавіцкага р-на Гомельскай вобл.), бел. дзяржаўны дзеяч, гісторык. Канд. гіст. н. (1974), праф. (1994). Скончыў БДУ (1971), Вышэйшыя курсы КДБ СССР у Мінску (1980). З 1974 на выкладчыцкай і камсам. рабоце ў БДУ, з 1979 у органах дзярж. бяспекі СССР, нач. кафедры, нам. нач. Ін-та нац. бяспекі Рэспублікі Беларусь. З 1994 нач. аддзела Савета Бяспекі, з 1995 нам. дзярж. сакратара Савета Бяспекі Рэспублікі Беларусь. З 2000 Старшыня К-та дзярж. кантролю Рэспублікі Беларусь. Асн. навук. даследаванні па гісторыі патрыят. падполля і партыз. руху на Беларусі ў 1941—44, органаў дзярж. бяспекі БССР, тэарэт. праблемах забеспячэння нац. бяспекі Рэспублікі Беларусь. Адзін з аўтараў прац «Усенародная барацьба ў Беларусі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны» (т. 1, 1983), «Палітыка-метадалагічныя асновы дзейнасці органаў дзяржбяспекі СССР» (ч. 1—3, 1988) і інш.

Тв.: В дни суровых испытаний: Укрепление рядов КП(б)Б в условиях подполья в годы Великой Отечественной войны (1941—1944). Мн., 1981; Реакционная сущность современного национализма. Мн., 1985; Союз — наша судьба (о проблемах сохранения союзной государственности). Мн., 1991; Межэтнические отношения в Республике Беларусь как фактор ее национальной безопасности. Мн., 1994; Органы госбезопасности БССР в годы Великой Отечественной войны (1941—1945). Мн., 1994; Актуальные вопросы реализации Концепции национальной безопасности Республики Беларусь. Мн., 1997.

ТО́ЙНБІ (Toynbee) Арналд Джозеф (14.4.1889, Лондан — 22.10.1975), англійскі гісторык, філосаф, сацыёлаг і грамадскі дзеяч. Працаваў у ВНУ, мін-ве замежных спраў. На аснове сістэматызацыі факталагічнага матэрыялу падрыхтаваў сваю асн. 12-томную працу — «Даследаванне гісторыі» (1934—1961), у якой распрацаваў канцэпцыю сутнасці гісторыі. Паводле Т., сусв. гісторыя — гэта сукупнасць своеасаблівых і адносна замкнёных цывілізацый, якія ў сваім развіцці (ад узнікнення да заняпаду і гібелі) праходзяць некалькі стадый. Лічыў рухальнай сілай развіцця цывілізацый «творчую меншасць», якая, абапіраючыся на свае здольнасці, вядзе за сабою «інертную большасць». Не здолеўшы вырашыць чарговую сац.-гіст. праблему, «меншасць» пачынае сілай навязваць сваю ўладу. У выніку ўзнікае ўсведамленне несправядлівасці і адбываецца «раскол у духу», што прыводзіць да разбурэння цывілізацыі. Даючы ацэнку тагачаснаму стану «цывілізацыі заходняга хрысціянства», Т. зрабіў выснову, што яе можа выратаваць толькі ўсяленская рэлігія, створаная на аснове аб'яднання сусв. прапаведніцкіх культур. Аўтар твораў «Грэчаская гістарыч-

ная думка» (1924), «Хрысціянства і цывілізацыя» (1946), «Цывілізацыя перад тварам выпрабавання» (1948), «Свет і Захад» (1953), «Амерыка і сусветная рэвалюцыя» (1962), «Гарады ў руху» (1970) і інш.

Тв.: Рус. пер. — Постижение истории: Избр. М., 2001; Цивилизация перед судом истории. М., 2002. *І.В.Катляроў.*

ТОК, т а к а в і ш ч а, месца *такавання* палігамных відаў птушак (цецерукоў, глушцоў, рабчыкаў, турухтанаў і інш.). У шэрагу відаў Т. многія гады знаходзіцца на пэўным месцы. Памеры — ад невял. пляцовак да 100 га і больш.

ТОК з б о ж ж а в ы, пляцоўка для абмалоту і ачысткі збожжа. Звычайна робіцца глінабітным у *гумне*. На Пн Беларусі — само гумно. Часам Т. наз. земляную (часцей глінабітную) падлогу ў якім-н. памяшканні, напр., у сенцах. Сучасны Т. — крытая пляцоўка, дзе на спец. агрэгатах сушаць і ачышчаюць зерне.

ТОК э л е к т р ы ч н ы, упарадкаваны рух эл. зарадаў у правадніках (гл. *Віхравыя токі*, *Ток зрушэння*, *Электрычны ток*). Б л у к а ю ч ы я Т. — эл. токі, якія праходзяць у зямлі пры яе выкарыстанні як токаправоднага асяроддзя.

ТОК ЗРУШЭ́ННЯ, фізічная велічыня, што характарызуе магн. дзеянне пераменнага *электрычнага поля*. Уведзены Дж.К.*Максвелам* у яго тэорыі эл.-магн. поля: пераменнае эл. поле стварае адпаведнае *магнітнае поле* па такіх жа законах, што і ток праводнасці. Шчыльнасць Т.з. $J_{зруш} = \partial\vec{D}/\partial t$, дзе D — вектар *электрычнага зрушэння* (гл. *Максвела ўраўненні*).

Поўны Т.з. складаецца з в а к у у м н а г а Т.з., абумоўленага скорасцю змены *напружанасці электрычнага поля* ў вакууме (без руху эл. зарадаў; не суправаджаецца выдзяленнем джоўлевай цеплаты), і п а л я р ы з а ц ы й н а г а Т.з. ў дыэлектрыках, абумоўленага зрушэннем звязаных эл. зарадаў у рэчыве (суправаджаецца выдзяленнем джоўлевай цеплаты; гл. *Дыэлектрычныя страты*). Т.з. забяспечвае замкнёнасць ланцугоў любых непастаянных токаў, напр., пры зарадцы (разрадцы) кандэнсатара паміж яго абкладкамі ўзнікае Т.з., што замыкае эл. ланцуг.

ТО́КА Салчак Калбакхарэкавіч (15.12.1901, мяст. Мерген, цяпер Каа-Хемскі р-н, Тыва — 11.5.1973), тывінскі пісьменнік. Герой Сац. Працы (1971). Скончыў Камуніст. ун-т прац. Усходу ў Маскве (1929). Друкаваўся з 1935. Аўтар п'ес «Жанчына» (1935), «Узун-Кара і Семіс-Кара» (1937), «Ажыццёўленая мара» (1954), аўтабіягр. аповесці «Слова арата» (кн. 1—2, 1950—56, кн. 3 — «Новая Тува», 1964), дакумент. аповесці «Чаго не бачыў бацька — сын убачыць» (1963). Дзярж. прэмія СССР 1951.

Тв.: Рус. пер. — Обновление. Очерки. Статьи. Кызыл, 1967; Слово арата. Кн. 1—3. М., 1972.

Літ.: Х а д а х а н э М.А. Салчак Тока и тувинская проза // Хадаханэ М.А. Тувинская проза. Кызыл, 1968. *А.К.Гардзіцкі.*

ТО́КАРАВА Вікторыя Самойлаўна (н. 20.11.1937, С.-Пецярбург), руская пісьменніца. Скончыла Усесаюзны дзярж. ін-т кінематаграфіі (1967). Друкуецца з 1964. Першая кніга — «Пра тое, чаго не было» (1969). У зб-ках аповесцей і апавяданняў «Калі стала трошкі цяплей» (1972), «Лятаючыя арэлі» (1978), «Карыда» (1993), «Дзень без хлусні» (1994) і інш. канфлікт асобы з абывацельскім цвярозым сэнсам, пошукі ідэалу, тэма кахання. Прозе Т. уласцівы тонкі псіхалагізм, шчырасць, адкрытасць фіналу, гумар, іронія. Аўтар п'ес, сцэнарыяў фільмаў «Урок літаратуры» (1968), «Джэнтльмены ўдачы» (1972; разам з Г.Данелія), «Міміно» (1978; разам з Р.Габрыядзе і Данелія), «Ішоў сабака па раялі» (1979) і інш.

Тв.: Телохранитель: Рассказы. М., 1998; Банкетный зал. М., 2000; Стрелец. М., 2001.

ТО́КАРАЎ Генадзь Барысавіч (н. 9.12.1931, г. Смаленск, Расія), бел. акцёр. Засл. арт. Беларусі (1967). Скончыў тэатр. студыю ў Смаленску (1955). З 1956 працуе ў Брэсцкім т-ры драмы і музыкі. Выканаўца драм., характарных роляў. Стварыў пераканаўчыя сцэн. вобразы сучаснікаў: Андрэй, Алег («У добры час!», «У пошуках радасці» В.Розава), Сеўка («Шануй бацьку свайго» В.Лаўрэнцьева), Цімур Зямны («Лейтэнанты» А.Пінчука) і інш. Адметнай характарнасцю, мяккім гумарам, пластычнай выразнасцю і сатыр. завостранасцю пазначаны яго пазнейшыя работы: Кукушкін, Рагулін («Брэсцкая крэпасць», «Людзі і камяні» К.Губарэвіча), Нічыпар («Хто смяецца апошнім» К.Крапівы), Скаромны («Таблетку пад язык» А.Макаёнка), Ермалай («Характары» паводле В.Шукшына), Вурм («Каварства і каханне» Ф.Шылера), Мендоза («Дзень цудоўных падманаў» Р.Шэрыдана) і інш. Сярод інш. роляў: Дук («...Выратаваць хачу зямную прыгажосць...» паводле твораў А.Пушкіна), Бальшынцаў («Месяц у вёсцы» І.Тургенева), Антоніо («Вар'яцкі дзень, або Жаніцьба Фігаро» П.Бамаршэ), Гэзгаж («Дамы і гусары» А.Фрэдры), Хмелік («Сола для гадзінніка з боем» О.Загрэдніка). *Р.М.Бакіевіч.*

ТО́КАРАЎ Фёдар Васілевіч (14.6.1871, станіца Егарлыкская Растоўскай вобл., Расія — 7.6.1969), расійскі канструктар стралковай зброі. Д-р тэхн. н. (1940). Герой Сац. Працы (1940). Скончыў казацкае юнкерскае вучылішча (1900). У 1907 перарабіў магазінную вінтоўку ўзору 1891 у аўтаматычную. З 1916 на зброевым з-дзе. У 1927 сканструяваў пісталет-кулямёт (аўтамат) пад рэвальверны патрон, у 1930—40-х г. самазарадныя пісталет ТТ, самазарадныя вінтоўкі СВТ-38, СВТ-40, аўтам. вінтоўку АВТ-40 (выкарыстоўваліся ў Вял. Айч. вайну). Дзярж. прэмія СССР 1941.

ТО́КАТЫ, дзеючы вулкан у цэнтр. ч. в-ва Хакайда, у Японіі. Складзены з андэзітаў. Расчлянёны эрозіяй на некалькі пікаў выш. да 2077 м. Апошняе вывяржэнне ў 1962. Б.ч. года ўкрыты снегам. Тэрмальныя крыніцы. У складзе нац. парку Дайсецудзан. Радовішча серы.

ТО́КІО, горад, сталіца Японіі. Знаходзіцца на ПдУ в-ва Хонсю, на раўніне Канто, каля ўпадзення рэк Сумідa і Тама ў бухту Сінагава Такійскага зал. Ціхага акіяна. Адзін з найбуйнейшых гарадоў свету. У т.зв. сталічны раён ува-



Цэнтральная частка **Токіо**.



Панарама **Токіо**.

ходзяць гарады і нас. пункты 4 прэфектур, 34 750 тыс. ж. (2000). Т. — гал. вузел чыгунак і аўтадарог краіны, буйны порт (штогадовы грузаабарот больш за 80 млн. т). Міжнар. аэрапорты Ханеда і Нарыта. Вузел скорасных чыгунак і нац. аўтастрад. У Т. ствараецца каля 30% валавога ўнутр. прадукту краіны. Таварныя, фондавыя і валютныя біржы, штаб-кватэры яп. і замежных манаполій, банкі, страхавыя і трансп. кампаніі. Асн. галіны прам-сці: машынабудаванне (трансп. сродкі, станкі, дакладныя прылады, эл.-тэхн. і электроннае абсталяванне), металургічная, хім. (лякарствы, касметыка, фотатавары, лакі, фарбы і інш.), нафтаперапр. і нафтахім. (у т.л. валокны, пластмасы), паліграф. (каля 50% вытв-сці ў краіне), харч., лёгкая, вытв-сць цацак і інш. Метрапалітэн. Такійскія дзярж. і муніцыпальны ун-ты, прыватныя ун-ты Васэда, Кэйо, Мэйдзі. Яп. АН. Яп. акадэмія мастацтваў. Нац. даследчы цэнтр абароны ад стыхійных бедстваў. Тэатры, у т.л. нац. тэатр *Кабукі*. Больш за 30 музеяў. Цэнтр турызму міжнар. значэння.

У 1457 на месцы сучаснага Т. пабудаваны замак Эда, вакол якога пачалі расці пасяленні рамеснікаў і гандляроў. У канцы 16 ст. замкам завалодаў заснавальнік 3-й дынастыі *сёгунаў* (правіцеляў) Японіі Іэясу Такугава. На працягу перыяду праўлення сёгунаў *Такугава* (1603—1867) Эда быў іх рэзідэнцыяй (афіц. сталіца г. Кіёта). У 18 ст. Эда — адзін з найбуйн. гарадоў свету (у 1787 — 1,3 млн. чал.). У 1869 у Эда перанесена з Кіёта рэзідэнцыя імператара, горад стаў сталіцай Японіі і перайменаваны ў Т. («усходняя сталіца»). У 2-й пал. 19 ст. тут развіваліся шаўковая, лакавая, фаянсавая і эмалевая, з канца 19 ст. — машына- і суднабудаўнічая прам-сць. У 1923 амаль палавіна горада знішчана землетрасеннем і пажарамі. У 1944—45 многія кварталы зруйнаваны бамбардзіроўкамі амер. авіяцыі. У 1948 у Т. адбыўся судовы працэс над гал. японскімі ваен. злачынцамі (гл. *Такійскі працэс*). Месца правядзення XVIII Алімп. гульняў (1964).

Гістарычна Т. падзяляецца на Стары горад і Новы горад. Цэнтр забудаваны шчыльна, ускраіны — нераўнамерна. У цэнтры знаходзяцца: комплекс імператарскага палаца (1457, пашыраны ў 1624—44, да 1869 замак Эда — узор яп. замкавай архітэктуры перыяду Эда); палацавы комплекс (каля 1600, перабудаваны ў канцы 19 — пач. 20 ст.), новы палац (1960); паркі Рыкугіен (1695—1702) і Уэна са званіцай 17 ст.; сінтаісцкія храмы Тосёгу (сучасны выгляд з 17 ст.) і Мэйдзі (канец 19 ст.), свяцілішча Ясукуні (1919); будыйскі храм Канон (засн. у 7 ст., адноўлены ў 1955). Сярод значных будынкаў: палац Акасака (1899—1908, арх. А.Катаяма), парламент (1918—36), т-р Кабукі (1924, арх. С.Акада), цэнтр. тэлеграф (1925, арх. М.Ямада). Вылучаюцца пабудовы *К.Тангэ*, К.Маэкава — шпіталь Кэйо (1948), Метраполітэн фестывал хол (1958—61), комплекс ун-та Гакусёін (1959—60), грамадскія і жылыя будынкі. У 2-й пал. 20 ст. створаны новыя гар. цэнтры Т. з вышынными і падземнымі збудаваннямі, жылымі дамамі.

Літ.: Иконников А.В., Заварухин Ю.И. Токио. Л., 1978.

ТОЛ, тое, што *трынітраталуол*.

ТО́ЛА, рака ў Манголіі, правы прыток р. Архон (бас. р. Селенга). Даўж. 704 км, пл. бас. 53,2 тыс. км^2. Пачынаецца на нагор'і Хэнтэй, цячэ пераважна па нізкагор'ях і ўзгорыстых раўнінах. Летнія паводкі, зімой нізкі сцёк. Сярэдні расход вады каля 25 м^3/с. Ледастаў з канца кастр. да сярэдзіны красавіка. На Т. — г. Улан-Батар.

ТО́ЛАНД (Toland) Джон (30.11.1670, каля г. Ландандэры, Вялікабрытанія — 11.3.1722), англійскі філосаф. Вучыўся ва ун-тах Глазга (1687—90), Эдынбурга (1690), Лейдэна (1691—92), Оксфарда (1693—95). У творах «Племя левітаў» (1691, не захаваўся), «Хрысціянства без таямніц» (1696) выступіў з крытыкай хрысціянства, за што абвінавачаны ў нападках на рэлігію і маральнасць і прыгавораны да зняволення, але схаваўся. Выдаў паліт. творы англ. рэспубліканцаў Дж.Мільтана (1699) і Дж.Гарынгтана (1700). У асн. філас. працах «Лісты да Серэны» (1704) і «Пантэістыкан» (1720) развіваў ідэі матэрыяльнасці бясконцага і вечнага Сусвету, адзінства руху і матэрыі. Рух разглядаў як сутнасную, універсальную ўласцівасць матэрыі, якая характарызуецца спрадвечнай актыўнасцю, але не выходзіў за межы механіст. матэрыялізму, адмаўляў развіццё прыроды і ўзаемасувязь руху матэрыі і яе якасных змен. Абвяргаў вучэнні Б.*Спінозы* пра нерухомасць і нязменнасць субстанцыі і пра мысленне як яе ўсеагульны атрыбут і канцэпцыю І.Ньютана пра абсалютную прастору. Абгрунтаваў палажэнне пра непарыўную сувязь прасторы і часу з рухам і матэрыяй. *А.Б.Савеня.*

ТО́ЛЕР (Toller) Эрнст (1.12.1893, Шамоцын Куяўска-Паморскага ваяв., Польшча — 22.5.1939), нямецкі пісьменнік; адзін з лідэраў *экспрэсіянізму*. Вучыўся ў Грэноблі (да 1914), у Гайдэльбергскім і Мюнхенскім ун-тах. За ўдзел у рэв. падзеях зняволены ў турму (1919—24). З 1933 у эміграцыі. Чалавек і рэвалюцыя — гал. тэма яго драм «Чалавек-маса» (1921), «Разбуральнікі машын» (1922), «Хінкеман», «Вызвалены Вотан» (абедзве 1923), «Гоп-ля, мы жывём» (1927), «Тушыць катлы!» (1930), «Пастар Галь» (1939). Аўтар зб. вершаў «Кніга ластавак» (1924), аўтабіягр. нататак «Юнацтва ў Германіі» (1933), кн. «Лісты з турмы» (1935), публіцыстыкі. У творах праблемы гуманнасці і жорсткасці, асобы і гісторыі, рэв. масы і яе правадыра, небяспекі нацызму; для іх характэрны абстрагаваныя вобразы-сімвалы, гратэск, настроі адзіноты, бездапаможнасці, катастрафізму.

Тв.: Рус. пер. — Тюремные песни. М., 1925; Штурм голода: Воспоминания и наброски. М., 1926; Живем, живем! Л., 1928; Дело об убийстве. М., 1934.

Літ.: Экспрессионизм. М., 1966.

Е.А.Лявонава.

ТО́ЛКІН, Толкіен (Tolkien) Джон Рональд Руэл (3.1.1892, г. Блумфантэйн, Паўд.-Афр. Рэспубліка — 2.9.1973), англійскі пісьменнік, вучоны-філолаг. У Англіі з 1895. Вучыўся ў Оксфардскім ун-це (1911—14). З 1920 праф. Лідскага, з 1925 Оксфардскага ун-таў. Вядомасць прынесла казачна-гераічная эпапея «Валадар Кольцаў» (раманы «Брацтва Кальца», «Дзве крэпасці», абодва 1954; «Вяртанне караля», 1955; перапрацаванае выд. 1966; экранізаваны ў 2001), у якой праблемы гіст. лёсу чалавецтва, прыроды і шматаблічнасці зла, суадносін улады і дыктату. Эпічным сюжэтам і вобразам яго твораў адпавядаюць патэтычны стыль і насычанасць фантастыкай; у іх фальклор. вобразы суіснуюць з народжанымі ўласнай фантазіяй, у маст. тканку якой уплецены каламбуры, загадкі, шматсэнсавыя сімвалы. Аўтар аповесці-казкі «Хобіт, або Туды і назад» (1937), незавершаных твораў «Сільмарыліён» (выд. 1977), «Кніга згубленых паданняў» (выд. 1983—84). Апублікаваў манаграфіі пра Дж.Чосера (1934), пра эпас «Беавульф» (1937), слоўнік сярэднеангл. мовы, зб. артыкулаў і эсэ «Дрэва і ліст» (1964).

Тв.: Рус. пер. — Собр. соч. Т. 1—4. Тула, 1994.

Літ.: Кошелев С.Л. Жанровая природа «Повелителя Колец» Дж.Р.Р.Толкина // Проблемы метода и жанра в зарубежной литературе. М., 1981. Вып. 6. *Е.А.Лявонава.*

ТОЛЬ (ад франц. tôle), рулонны дахавы гідраізаляцыйны матэрыял. Атрымліваюць апрацоўкай дахавага кардону дзёгцевымі прадуктамі. Выкарыстоўваецца для пакрыцця дахаў часовых збудаванняў (менш даўгавечны, чым *рубероід*), гідра- і параізаляцыі буд. канструкцый.

ТОЛЬ Карл Фёдаравіч (19.4.1777, с. Кескверэ Ляэнескага пав., Эстонія —

5.5.1842), расійскі военачальнік. Ген. ад інфантэрыі (1826). Граф (1829). Ганаровы чл. Пецярбургскай АН (1836). Скончыў Сухап. корпус (1796). Удзельнічаў у *Швейцарскім паходзе Суворава 1799*, у войнах з Францыяй (1805) і Турцыяй (1806—09). У *вайну 1812* (з ліп.) ген.-кватэрмайстар 1-й арміі. Удзельнік бітваў пад Смаленскам і каля с. Барадзіно. З вер. 1812 в.а. ген.-кватэрмайстра аб'яднаных армій, са снеж. 1812 ген.-кватэрмайстар Гал. штаба пры Аляксандру I. Удзельнічаў у кампаніях 1813—14. Са снеж. 1815 ген.-кватэрмайстар Гал. штаба, з 1823 — нач. штаба 1-й арміі. У час рус.-тур. вайны 1828—29 і падаўлення *паўстання 1830—31* нач. штаба дзеючай арміі. З 1830 чл. Дзярж. савета. На аснове матэрыялаў па гісторыі вайны склаў апісанне бітвы каля с. Барадзіно 24 і 26 жн. 1812 (1839).

А.М.Лукашэвіч.

ТОМ, рака ў Хакасіі, Кемераўскай і Томскай абл. Расіі, правы прыток р. Об. Даўж. 827 км, пл. бас. 62 тыс. км^2. Пачынаецца на схілах Абаканскага хр.; у верхнім цячэнні — горная рака, ніжэй цячэ па Кузнецкай катлавіне і Зах.-Сібірскай раўніне. Асн. прытокі: Мрасу, Кондама, Уньга (злева), Уса, Верхняя, Сярэдняя і Ніжняя Церсь, Тайдон (справа). Сярэдні расход вады каля г. Томск 1110 м^3/с. Ледастаў з канца кастр. да пач. мая. Суднаходная ад вуся р. Мрасу (643 км). Сплаўная. У бас. Т. — больш за 1 тыс. азёр. На Т. гарады Новакузнецк, Кемерава, Томск. У бас. Т. *Кузнецкі вугальны басейн.*

ТОМАС (Thomas) Сідні Джылкрыст (16.4.1850, Лондан — 1.2.1885), англійскі металург. Вывучаў хімію і металургію ў Каралеўскай горнай школе. У 1878 распрацаваў спосаб перапрацоўкі высакафосфарыстых чыгуноў у канвертары ў сталь (*тамасаўскі працэс*). На выраб сталі гэтым спосабам атрымаў патэнты.

Літ.: Мезенин Н.А. Повесть о мастерах железного дела. М., 1973; Беккерт М. Мир металла: Пер. с нем. М., 1980.

ТОМАС (Thomas) Эдуард Донал (н. 15.3.1920, Март, ЗША), амерыканскі вучоны ў галіне гематалогіі і анкалогіі. Д-р медыцыны (1946). Скончыў Ун-т Тэхаса ў г. Остын (1943). З 1955 у Калумбійскім, з 1963 у Вашынгтонскім ун-тах, з 1975 у Цэнтры па вывучэнні раку г. Сіэтл. Навук. працы па праблемах трансплантацыі касцявога мозга пры парушэннях кроваўтварэння; прапанаваў метады прыгнечання імунітэту (т. зв. праграмы імунадэпрэсіі) рэцыпіента для прадухілення рэакцыі адарвання трансплантата. У 1956 зрабіў перасадку касцявога мозга чалавеку. Нобелеўская прэмія 1990 (разам з Дж. Э.*Марры*).

ТОМАШАК (Tomášek) Вацлаў Ян (17.4.1774, Скуцеч, Чэхія — 3.4.1850), чэшскі кампазітар, піяніст, педагог. Яго творчасць вызначыла пераход ад класіцызму да рамантызму ў чэш. музыцы. Стваральнік новых фп. жанраў: лірычных эклог, рапсодый, дыфірамбаў, якія паўплывалі на развіццё лірычнай фп. мініяцюры Ф.Мендэльсона, Ф.Шуберта, Р.Шумана. У яго творчасці вылучаюцца вак. творы (на сл. І.В.Гётэ, Ф.Шылера, Г.Гейнэ), месы і рэквіемы. Сярод інш. твораў: 2 оперы, у т.л. «Серафіна» (паст. 1811); 3 сімф. увертюры для арк.; 2 канцэрты для фп. з арк., камерна-інстр. ансамблі, творы для фп., аргана, шклянога гармоніка і інш.

ТОМБЕРГ Лізавета Сцяпанаўна (28.1.1909, с. Вайскорава Тосненскага р-на Ленінградскай вобл. — 1988), карэльская актрыса. Нар. арт. СССР (1959). З 1932 у Фінскім драм. т-ры ў Ленінградзе, з 1940 у Фінскім драм. т-ры ў Петразаводску. Мастацтва Т. вызначалася ўнутр. сілай і шырокім дыяпазонам. Сярод роляў: Малання («Ці прымеш мяне, зямля карэльская?» А.Тыманена), Мая («На сплаўной рацэ» Т.Пакала), фру Бон («Людзі з Дангора» М.Андэрсена-Нексё), Гурмыжская («Лес» А.Астроўскага), Ранеўская («Вішнёвы сад» А.Чэхава), Васа Жалязнова, Малання і Варвара («Васа Жалязнова», «Ягор Булычоў і іншыя» М.Горкага), Эльза («Вецер з поўдня» паводле А.Грына) і інш. Дзярж. прэмія СССР 1950. Дзярж. прэмія Расіі 1972.

ТОМЕК (Tomek) Вацлаў Уладзівай (31.5.1818, г. Градзец-Кралаве, Чэхія — 12.6.1905), чэшскі паліт. дзеяч, гісторык. Замежны чл.-кар. Пецярбургскай АН (1878). Вучань Ф.*Палацкага*. У час рэвалюцыі 1848—49 дэп. аўстр. рэйхстага, у 1861—95 — чэш. сейма. З 1860 праф. гісторыі Аўстрыі ў Пражскім ун-це. З 1885 пажыццёвы чл. палаты панаў. Выступаў з пазіцый *аўстраславізму*. Аўтар прац «Гісторыя Пражскага універсітэта» (1849), «Гісторыя горада Прагі» (ч. 1—12, 1855—1901), «Гісторыя чэшскага народа» (1865), «Ян Жыжка» (1879) і інш. Творы Т. багатыя фактычным матэрыялам і выкарыстаннем малавядомых крыніц.

ТОМКАВІЧЫ, вёска ў Рубілкаўскім с/с Дзяржынскага р-на Мінскай вобл., каля аўтадарогі Негарэлае—Самахвалавічы. Цэнтр калгаса. За 16 км на У ад г. Дзяржынск, 27 км ад Мінска, 9 км ад чыг. ст. Фаніпаль. 359 ж., 113 двароў (2002). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ТОМСАН (Thomson) Джозеф Джон (18.12.1856, г. Манчэстэр, Вялікабрытанія — 30.8.1940), англійскі фізік; адзін са стваральнікаў электроннай тэорыі металаў, заснавальнік міжнар. навук. школы фізікаў-эксперыментатараў. Чл. Лонданскага каралеўскага т-ва (1884; у 1915—20 прэзідэнт). Замежны ганаровы чл. АН СССР (1975). Бацька Дж. П.*Томсана*. Скончыў Кембрыджскі ун-т (1880). У 1884—1919 праф. Кембрыджскага ун-та і дырэктар *Кавендышскай лабараторыі*. З 1918 узначальваў Трыніты-каледж у Кембрыджы. Навук. працы па электрычнасці і магнетызме, вывучэнні эл. току ў газах, катодных і рэнтгенаўскіх прамянёў, атамнай фізіцы. Адкрыў электрон (1897) і вызначыў адносіны яго зараду да масы (1898). Прапанаваў адну з першых мадэлей атама (1903—04). Сканструяваў незалежна ад ням. фізіка К.Браўна электронна-прамянёвую трубку (1897). Прапанаваў прынцып дзеяння мас-спектрометра (1907) і



Э.Д.**Томас**.



Дж.Дж.**Томсан**.

метад парабал (1911) для вызначэння мас часціц у іонных пучках, што прывяло да стварэння мас-спектраметрыі. Атрымаў першыя эксперым. звесткі аб існаванні ізатопаў, адкрыў 2 ізатопы неону (1912). Нобелеўская прэмія 1906. Медалі імя Б.Франкліна (1923), імя М.Фарадэя.

Тв.: Рус. пер. — Электричество и материя. М.; Л., 1928; По ту сторону электрона. М., 1930.

Літ.: Тимирязев А.К. Жизнь и труды Дж.Дж.Томсона // Успехи химии. 1941. Т. 10, вып. 1; Льоцци М. История физики: Пер. с итал. М., 1970. С. 292—298, 372—378; Гнедина Т.Е. Открытие Джи-Джи (Томсон): Повесть об ученом. М., 1973. *А.І.Болсун.*

ТОМСАН (Thomson) Джордж Паджэт (3.5.1892, г. Кембрыдж, Вялікабрытанія — 10.9.1975), англійскі фізік. Чл. Лонданскага каралеўскага т-ва (1930). Сын Дж.Дж.*Томсана*. Скончыў Кембрыджскі ун-т (1914), дзе працаваў з 1919. З 1922 праф. Абердзінскага ун-та (Шатландыя), з 1930 — Імперскага каледжа навукі і тэхналогіі (Лондан), у 1952—62 узначальваў адзін з каледжаў у Кембрыджы. Навук. працы па атамнай і ядз. фізіцы, квантавай механіцы, тэорыі рассеяння мікрачасціц, эл. разрадах у газах. Незалежна ад амер. фізікаў К.Дж.*Дэвісана* і Л.Джэрмера адкрыў дыфракцыю электронаў, што эксперыментальна пацвердзіла хвалевыя ўласцівасці мікрааб'ектаў. Распрацаваў апаратуру і метады вывучэння электронаграм, што дало пачатак электронаграфіі. Нобелеўская прэмія 1937 (разам з Дэвісанам).

Тв.: Рус. пер. — Атом. М.; Л., 1932; Предвидимое будущее. М., 1958; Дух науки. М., 1970.

Літ.: Льоцци М. История физики: Пер. с итал. М., 1970. С. 404—405. *А.І.Болсун.*

ТО́МСАН (Thomson) Уільям (лорд Кельвін; Kelvin; 26.6.1824, г. Белфаст, Вялікабрытанія — 17.12.1907), англійскі фізік, адзін са стваральнікаў тэрмадынамікі і кінетычнай тэорыі газаў. Чл. Лонданскага каралеўскага т-ва (1851; у 1890—95 яго прэзідэнт). Ганаровы замежны чл. Пецярбургскай АН (1896; чл.-кар. 1877). Скончыў Кембрыджскі ун-т (1845). У 1846—99 праф. ун-та ў г. Глазга. Навук. працы па тэрмадынаміцы, электрамагнетызме, тэорыі пругкасці, матэматыцы і тэхніцы. Увёў



Дж.П.**Томсан**.



У.**Томсан**.

паняцці абс. т-ры і абс. тэмпературнай шкалы (гл. *Кельвіна шкала*). Разам з Дж.П.*Джоўлем* адкрыў *Джоўля—Томсана эфект*. Незалежна ад Р.Ю.Э.*Клаўзіуса* даў адну з першых фармулёвак *другога закону тэрмадынамікі* (1851) і выказаў гіпотэзу аб «цеплавой смерці» Сусвету (1852). Правёў грунтоўныя даследаванні па тэрмадынаміцы пары і вадкасці (гл. *Кельвіна ўраўненне*), прапанаваў тэорыю тэрмаэл. з'яў і адкрыў *Томсана з'яву*. Актыўна ўдзельнічаў у наладжванні тэлегр. сувязі па трансатлантычным кабелі, даў разлік эл. контура і вывеў формулу перыяду эл. ваганняў (формула Т.). Сканструяваў і ўдасканаліў шэраг фіз. прылад і вымяральных інструментаў. У яго гонар названа адзінка абс. т-ры — *кельвін*.

Літ.: Жекулин Л.А. Вильям Томсон (1824—1907 гг.) // Электричество. 1957, № 12; Мак-Дональд Д. Фарадей, Максвелл и Кельвин: Пер. с англ. М., 1967; Голин Г.М., Филонович С.Р. Классики физической науки (с древнейших времен до начала XX в.). М., 1989. *А.І.Болсун.*

ТО́МСАНА З'Я́ВА тэрмаэлектрычная, Томсана эфект, вылучэнне ці паглынанне некаторай колькасці цеплаты ў правадніку з эл. токам, уздоўж якога існуе градыент т-ры, дадаткова да вылучэння джоўлевай цеплаты (гл. *Джоўля—Ленца закон*); адна з *тэрмаэлектрычных з'яў*. Прадказаў У.*Томсан* у 1856, эксперыментальна ўстанавіў франц. фізік Ф.Леру і інш.

Колькасць цеплаты, што вылучаецца у Т.з., $Q_s = S \cdot \Delta T \cdot I \cdot t$, дзе I — сіла току, ΔT — градыент т-ры, t — час, S — каэф. Томсана (характарыстыка правадніка). Калі ўздоўж правадніка з эл. токам існуе градыент т-ры, прычым напрамак току адпавядае руху электронаў ад гарачага канца да халоднага, то пры пераходзе з больш нагрэтага ўчастка ў больш халодны электроны тармозяцца і перадаюць лішнюю энергію навакольным атамам (цеплата вылучаецца); пры адваротным напрамку току электроны пры пераходзе з больш халоднага ўчастка ў больш гарачы паскараюцца полем *тэрмаэлектрарухальнай сілы* і папаўняюць сваю энергію за кошт энергіі атамаў крышталічнай рашоткі (цеплата паглынаецца).

ТО́МСЕН (Thomsen) Ханс Петэр Юрген Юліус (16.2.1826, Капенгаген — 13.2.1909), дацкі хімік, адзін з заснавальнікаў тэрмахіміі. Член Дацкага каралеўскага т-ва навук (1860), з 1888 яго прэзідэнт. Скончыў Політэхн. ін-т у Капенгагене (1846), дзе і працаваў да 1866 і ў 1883—1902 (дырэктар). У 1866—1901 праф. Капенгагенскага ун-та. Навук. працы пераважна па тэрмахіміі. Распрацаваў асн. эксперым. методыкі і з высокай дакладнасцю вызначыў цеплавыя эфекты многіх хім. рэакцый (1852—86).

ТО́МСК, горад, цэнтр Томскай вобл. Расіі, порт на р. Том. Засн. ў 1604. 482 тыс. ж. (2000). Вузел аўтадарог, чыг. станцыя. Аэрапорт. Прам-сць: машынабудаванне і металаапрацоўка (ВА «Сібкабель», «Сібэлектраматор»; з-ды: эл.-мех., электралямпавы, радыётэхн., прыладабуд.; вытв-сць падшыпнікаў, рэжучых інструментаў), хім. (з-ды: гумавага абутку, хім.-фармацэўтычны), дрэваапр. (ф-кі: мэблевая, алоўкавая, запалкавая), харчовая. Вытв-сць буд. матэрыялаў. Навук. цэнтр Сіб. аддз. Расійскай АН. 6 ВНУ, у т.л. 2 ун-ты. 3 тэатры. Філармонія. Музеі: краязн., маст., Томскага ун-та. Барочная Уваскрэсенская царква (1789—1807), Гасціны двор (18 ст.), забудова цэнтра ў стылі класіцызму пач. 19 ст. У 1927—28 навуч. г. ў Т. існавала Бел. студэнцкая зямляцтва. У гады Вял. Айч. вайны ў Т. знаходзіўся ў эвакуацыі *Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы*.



Томск. Куток старога горада.

ТО́МСКАЯ ВО́БЛАСЦЬ. Размешчана на ПдУ Зах. Сібіры, у Рас. Федэрацыі. Утворана 13.8.1944. Пл. 316,9 тыс. км². Нас. 1068 тыс. чал. (2000), гарадскога 66,9%. Найб. шчыльна заселены паўд. і паўд.-ўсх. раёны. Цэнтр — г. *Томск*. Найб. гарады: Северск, Стражавой, Асіна, Калпашава.

Паверхня раўнінная, пераважаюць плоскія, забалочаныя тэр. Зах.-Сіб. раўніны. На ПнУ Кецка-Тымская, на ПдЗ Васюганская раўніны, на ПдУ адгалінаванні Кузнецкага Алатау (выш. да 211 м). Цэнтр ч. занята шырокай далінай р. Об, якая падзяляе тэр. на балоцістае левабярэжжа і ўзвышанае правабярэжжа. Карысныя выкапні: 75 радовішчаў нафты, 15 нафта- і 7 газакандэнсатных (*Заходне-Сібірская нафтагазаносная правінцыя*). 12 радовішчаў метал. руд (жал., тытанавых, рэдказямельных і інш.), торф, буры вугаль, буд. матэрыялы. Вял. запасы артэзіянскай пітной вады, тэрмальных і мінер. вод (бромістых, ёдзістых, серавадародных, радонавых). Клімат кантынентальны. Зіма суровая і працяглая, лета цёплае і кароткае. Сярэдняя т-ра студз. ад -19 °С да -21 °С, ліп. 17—18 °С. Ападкаў 400—550 мм за год, пераважна летам. Гал. р. Об з прытокамі Том, Чулым, Кець, Тым (справа), Чая, Парабель, Васюган (злева). Шмат азёр. Каля 30% тэр. забалочана. Глебы дзярнова-падзолістыя і тарфянабалотныя, на Пд і ПдУ — шэрыя лясныя і чарназёмныя. Пад лесам 63% тэр., пераважаюць хвойныя пароды (сіб.



кедр, лістоўніца, піхта, елка, хвоя), растуць бяроза, асіна.

Т.в. — індустр.-аграрны рэгіён Расіі. На долю прам-сці прыпадае каля 60% валавога ўнутр. прадукту. Гал. галіны прам-сці (паводле кошту прадукцыі): паліўная (51%), хім. (21%), маш.-буд. (17%), электраэнергетыка (9%), харчовая (7%). Штогадовая здабыча нафты

6—7 млн. т, прыроднага газу 5—6 млрд. м^3. Хім. (вытв-сць плутонію для АЭС, медпрэпаратаў, гумавага абутку), маш.-буд. (вытв-сць электрарухавікоў, горна-шахтавага абсталявання, кабелю, электралямпаў, падшыпнікаў, металарэзных інструментаў, мед. тэхнікі і інш.), лясная і дрэваапр. (піламатэрыялы, мэбля, алоўкі, запалкі) прам-сць. Вытв-сць электраэнергіі пераважна на ЦЭЦ. Харч. (мукамольная, масларобная, мясная, рыбакансервавая і інш.) і лёгкая (швейная, трыкат.) не забяспечваюць мясц. патрэбы. Вытв-сць буд. матэрыялаў. Сельская гаспадарка спецыялізуецца на мяса-малочнай жывёлагадоўлі і цяплічным агародніцтве. С.-г. ўгоддзі займаюць 1,4 млн. га, у т.л. ворныя землі 0,6 млн. га. Асн. збожжавыя культуры (пшаніца, жыта, ячмень) сеюць на Пд і ПдУ. Вырошчваюць бульбу, агародніну, кармавыя культуры. На долю жывёлагадоўлі прыпадае 70% валавога аб'ёму с.-г. прадукцыі. Гадуюць буйн. раг. жывёлу, вакол г. Томск жывёлагадоўчыя комплексы па прамысл. вытв-сці свіней, мяса птушкі і яек, цяплічныя гаспадаркі. Пушны промысел і зверагадоўля. Рыбалоўства. Асн. віды транспарту — водны і аўтамабільны. Суднаходства па рэках Об, Чулым, Том, Кець, Чая, Парабель, Васюган. Гал. рачныя парты: Томск, Аляксандраўскае, Асіна, Калпашава. Даўж. аўтадарог 4,5 тыс. км. Чыгунка Тайга—Томск—Асіна—Белы Яр (402 км) злучае Т.в. з Транссібірскай магістраллю. 8 аэрапортаў. Нафтаправод Аляксандраўскае—Анжэра-Суджанск, газаправод Мыльджына—Кузбас. *Г.С.Смалякоў.*

ТО́МСКІ (сапр. Г р ы ш ы н) Мікалай Васілевіч (19.12.1900, с. Рамушава Наўгародскай вобл., Расія — 17.11.1984), расійскі скульптар. Нар. маст. СССР (1960). Правадз. чл. АМ СССР (1949). Герой Сац. Працы (1970). Вучыўся ў Ленінградскім маст.-прамысл. тэхнікуме (1923—27). З 1948 выкладаў у Маскоўскім маст. ін-це імя В.Сурыкава (у 1964—70 рэктар). У 1968—83 прэзідэнт АМ СССР. Выканаў помнікі У.І.Леніну ў С.-Пецярбургу (1938), Варонежы (1940), Арле (1949—61), Вільнюсе (1952), Волагдзе (1958), Берліне (1970), Ташкенце (1974); С.Кіраву ў С.-Пецярбургу (1938); І.Апанасенку ў Белгарадзе (1944—49); М.Гогалю (1952), М.Ламаносаву (1953), М.Кутузаву (1973) ў Маскве; партрэты І.Чарняхоўскага, М.Гарэева (абодва 1947), П.Покрышава, А.Смірнова, І.Кажадуба (усе 1948), Гогаля (1951), У.Маякоўскага (1954), Д.Рыверы (1956—57), «Валгаградскі рабочы» (1970), С.Сяргеева (1972). Творам уласцівы спалучэнне індывідуальнага вобраза мадэлі з шырокім абагульненнем, героікай або паэтызацыяй вобраза. Аўтар эмблемы і фрыза будынка Мін-ва Узбр. сіл СССР, афармлення будынка Массавета і Маск. ун-та ў Маскве (усе 1940-х г.). Дзярж. прэміі СССР 1941, 1948, 1949, 1950, 1952, 1979. Ленінская прэмія 1972.

Тв.: В бронзе и граните. М., 1977.

Літ.: Б а л т у н П.К. Н.В.Томский: [Альбом]. 2 изд. М., 1976; М и н и н а В.Б. Н.Томский. М., 1980. *Т.В.Пешына.*



М.**Томскі**. Валгаградскі рабочы. 1970.

ТОН (ад грэч. tonos павышэнне голасу, тон, націск; напружанне) у а к у с т ы ц ы, гук пэўнай вышыні; фіз. характарыстыка гуку, якая вызначаецца яго частатой. Адрозніваюць: просты Т. (гарманічнае гукавое ваганне) і асноўны Т. (стварае акустычная сістэма, калі вагаецца з найніжэйшай для яе частатой). Гл. таксама *Абертон*.

ТОН у в ы я ў л е н ч ы м м а с т а ц т в е, зыходны прасцейшы элемент *святлаценю* ў натуры і маст. творы; ступень асвятлення і святлонасычанасці асобнага ўчастка прадмета і г.д. У творах жывапісу і графікі ствараецца прапарцыянальная прыроднай, багатая адценнямі шкала, у якой выбар святлаценявога Т. вызначаецца сістэмай адносін паміж Т., што стварае выразнасць святлаценю ў цэлым. Таксама зыходны элемент колеру ў прыродзе і *каларыту* ў творах мастацтва: якасць кожнага колеравага адцення, адпаведна асобнага ўчастка натуры або выявы ў судносінах да асн. колераў спектра (напр., лімонна-жоўты, вогненна-чырвоны). У сістэме жывапісу колеравыя Т. непадзельна звязаны з адпаведнай ёй сістэмай святлаценявых Т. Агульны Т. — колеравы строй маст. твора або матыву, асн. адценне, якое абагульняе і падпарадкоўвае сабе ўсе колеры карціны і вызначае адзінства каларыту. Фарбы ў такім «танальным» жывапісе аб'ядноўваюцца агульным Т. (напр., серабрыстым, залацістым, цёплым, халодным).



К.**Тон**. Храм Хрыста Збавіцеля ў Маскве. Фота пач. 20 ст.

ТОН у м у з ы ц ы, 1) фізічная характарыстыка муз. *гуку*, якая ўключае пэўную вышыню, гучнасць, тэмбр. 2) Мера, якая вызначае велічыню *інтэрвала* паміж гукамі, роўнага 1/6 а к т а в ы. У сучаснай 12-тонавай муз. сістэме найменшая адлегласць паміж гукамі — паўтон. 3) Ступень *гукарада, лада, гамы*, гук акорда, элемент мелодыі. 4) Характарыстыка слыхавага ўражання ад гучання голасу, муз. інструмента (чысты, фальшывы, роўны, ціхі і інш.). 5) У *майстэрзінгераў* — мелодыя-мадэль, на якую выконваліся розныя тэксты. 6) У сістэме царк. ладоў — вызначэнне лада (I Т., II Т. і г.д.). *Т.А.Дубкова.*

ТОН Канстанцін Андрэевіч (6.11.1794, С.-Пецярбург — 6.2.1881), рускі архітэктар. Акад. Пецярбургскай АМ (1830). Вучыўся ў Пецярбургскай АМ (1803—15) у А.*Вараніхіна*, выкладаў у ёй (з 1833 праф., з 1854 рэктар па архітэктуры). У 1815—19 працаваў у К-це для пабудоў і гідраўл. работ у Пецярбургу. У 1819—28 камандзіраваны ў Італію. Пабудовы Т. ў т. зв. руска-візант. стылі (гл. *Псеўдарускі стыль*) адметныя канстр. вырашэннямі (выкарыстанне буйных метал. канструкцый і інш.), высокай якасцю буд. работ. Сярод твораў: у Маскве — храм Хрыста Збавіцеля ў памяць вайны 1812 (1837—83, знесены ў 1930-я г., у 1990-я г. адноўлены), Вял. Крамлёўскі палац (1839—49, у сааўт.), *Аружэйная палата*, званіца Сіманава манастыра (закладзена ў 1835), Мікалаеўскі вакзал (цяпер Ленінградскі; 1845—52); у стылі класіцызму — будынак Малога т-ра (1838—40), Дом інвалідаў у Ізмайлаве (1839); у Пецярбургу — Мікалаеўскі вакзал (цяпер Маскоўскі; 1851). Аўтар т. зв. узорных праектаў цэркваў, альбома «Праекты цэркваў...» (1838).

Літ.: К и р и ч е н к о Е.И. К.Тон // Зодчие Москвы, М., 1981. Кн. I; С л а в и н а Т.А. К.Тон. Л., 1989.

ТО́НА (франц. tonne ад позналац. tunna бочка), адзінка *масы*; адна з асноўных

адзінак у сістэме МТС (метр, тона, секунда; гл. *Сістэмы адзінак*). Абазначаецца т. 1 т (метрычная) = 1000 кг. Т. і кратныя адзінкі кілатона (1 кт = 10^3 т) і мегатона (1 Мт = 10^6 т) шырока выкарыстоўваюцца ў тэхн. вымярэннях.

У англамоўных краінах выкарыстоўваюцца: доўгая, або вялікая Т. (1016,047 кг); кароткая, або малая Т. (907,185 кг); прабірная Т. — адзінка масы каштоўных металаў (29,1667 г у ЗША і 32,6667 г у Вялікабрытаніі); рэгістравая Т. — адзінка аб'ёму рэгістравай умяшчальнасці (унутр. памяшканняў) судна (2,831685 м^3).

ТО́НАВА, вёска ў Рубяжэвіцкім с/с Стаўбцоўскага р-на Мінскай вобл., на аўтадарозе Рубяжэвічы—Хатава. Цэнтр калгаса. За 40 км на Пн ад Стоўбцаў, 71 км ад Мінска. 435 ж., 180 двароў (2002). Сярэдняя школа, клуб. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

Вядома з пач. 16 ст. як маёнтак Тонва кн. Алелькавічаў у Віленскім ваяв. ВКЛ. З 17 ст. ўласнасць Радзівілаў, Ю.Капчэўскага, Рдултоўскіх, Багушэвічаў, Сліжняў. З 1793 у Рас. імперыі. З 1861 вёска ў Слабодкаўскай, з 1878 у Рубяжэвіцкай вол. Мінскага пав. У 1897 — 519 ж., 78 двароў. З 1921 у Стаўбцоўскім пав. Навагрудскага ваяв. Польшчы, з 1939 у БССР, з 1940 у Івянецкім, з 1962 у Стаўбцоўскім р-нах. *С.А.Галоўка.*

ТО́НГА (Tonga), Каралеўства Тонга (танганскае Pule'anga Fakatu'i 'o Tonga, англ. Kingdom of Tonga), дзяржава на аднайм. астравах на ПдЗ Ціхага акіяна. Пл. 748 км^2. Нас. 102,3 тыс. чал. (2002). Дзярж. мовы — танганская і англійская. Сталіца, гал. эканам. цэнтр і порт — г. *Нукуалофа* на в-ве Тангатапу. Краіна падзяляецца на 5 акруг. Нац. свята — Дзень незалежнасці (4 чэрв.).

Дзяржаўны лад. Т. — канстытуцыйная манархія. Уваходзіць у Садружнасць. Дзейнічае канстытуцыя 1875 (з папраўкамі і дапаўненнямі). Кіраўнік дзяржавы — кароль. Заканадаўчы орган — аднапалатная Заканадаўчая асамблея (30 членаў: кароль, члены кабінета міністраў і асабістага савета караля, 9 членаў, якіх выбірае знаць, і 9 членаў, якіх выбірае насельніцтва на 3 гады). Выканаўчую ўладу ажыццяўляюць кароль і кабінет міністраў на чале з прэм'ер-міністрам.



Герб і сцяг **Тонга**.

Прырода. Астравы вулканічныя (выш. да 1030 м, в-аў Као) і каралавыя (выш. некалькі м, некат. прыўзнятыя да 200 м). Найб. в-аў Тангатапу, пл. 257 км^2. Клімат трапічны марскі. Сярэднямесячныя т-ры ад 26 °С (люты) да 20 °С (жнівень). Ападкаў каля 2000 мм за год, на схілах гор да 3000 мм. Бываюць разбуральныя трапічныя ўраганы. На асобных астравах ёсць рэкі і ручаі, захаваліся трапічныя лясы (11% тэр.) з дрэвападобных папарацей, пальмаў, пандануса. Жывёльны свет збяднены (пацукі, мышы, кажаны). Шмат птушак. Мора багатае рыбай, чарапахамі, малюскамі. Ёсць прыродаахоўныя рэзерваты.

Насельніцтва. Больш за 98% складаюць танганцы — адзін з палінезійскіх народаў. Жывуць невял. групы метысаў, палінезійцаў з інш. астравоў, еўрапейцаў. Сярод вернікаў пераважаюць пратэстанты, ёсць католікі (16%) і мармоны (14%). Сярэднегадавы прырост 1,91% (2000). Сярэдняя шчыльн. 136,8 чал. на 1 км^2. З 150 астравоў заселены 45. Каля 68 тыс. чал. жыве на в-ве Тангатапу, дзе шчыльн. дасягае 264 чал. на 1 км^2. Гар. насельніцтва 43% (1997). У г. Нукуалофа каля 40 тыс. ж. (1998). 65% самадзейнага насельніцтва занята ў сельскай гаспадарцы, рыбалоўстве, марскіх промыслах. Значная эміграцыя ў Новую Зеландыю, Аўстралію і ЗША.



Гісторыя. А-вы Т. заселены палінезійцамі ў 2-м тыс. да н.э. У 10 ст. н.э. на Т. ўсталявалася ўлада правадыроў-жрацоў туі-тонга; у 15 ст. рэліг. і свецкая ўлады падзелены. У 1616 галандскія мараплаўцы В.Схаўтэн і Я.Лемер адкрылі 1-я з а-воў Т.; у 1643 А.Я.*Тасман* адкрыў буйнейшы з іх — Тангатапу; у 1773—74 Т. даследаваў Дж.*Кук*, які назваў іх а-вамі Таварыства. У 1797 на Т. з'явіліся еўрап. місіянеры. У 1831 яны схілілі ў прысцяянства правадыра а-воў Вавау — Таўфа'ахау Тупоу, які аб'яднаў пад сваёй уладай усе а-вы Т. і абвясціў сябе каралём Т. пад імем Георга Тупоу I [1845—93]. У 1875 прынята канстытуцыя Т., створаны парламент, значную частку якога складаюць прадстаўнікі традыц. арыстакратыі.

У 1900 Вялікабрытанія навязала каралю Георгу Тупоу II [1893—1918] дагавор, які ператварыў Т. ў брыт. пратэктарат. Новы дагавор 1958 даў Т. права знешнеэканам. зносін. У 1968 брыт. ўрад заключыў дагавор з каралём Таўфа'ахау Тупоу IV [з 1966] пра пераход Т. да незалежнасці; 4.7.1970 абвешчана незалежнасць. На Т. дзейнічае адна паліт. партыя — Нар. партыя.

Гаспадарка Т. — слабаразвітая аграрная краіна. Валавы ўнутр. прадукт на 1 чал. складае 1720 дол. (1999). 32,1% яго ствараецца ў сельскай гаспадарцы і рыбалоўстве, 15,4% — у прам-сці, 52,5% — у сферы паслуг. Асн. с.-г. культуры: какосавая пальма, бананы, ямс, таро, хлебнае дрэва, батат, маніёк, ваніль, какава. Развіваецца жывёлагадоўля (буйн. рог. жывёла, свінні, коні, козы). Прамысл. рыбалоўства. Вырошчванне какосавай пальмы, ваніль, какава — для экспарту. Прамысловасць: перапрацоўка с.-г. прадукцыі, рыбы, вытв-сць будматэрыялаў, піва, мыла, свечак, тытуню, вопратак, абутку. Энергет. магутнасці 20 тыс. кВт. Гал. экспарт. партнёры: Аўстралія, Японія, Новая Зеландыя, ЗША, Германія, Фіджы. Імпарт: Аўстралія, Новая Зеландыя, ЗША, Японія, Фіджы. Экспарт: какосавае алей, какосавая капра, ваніль, какава, бананы, рыба, ямс, таро, батат, маніёк. Імпарт: прадукты харчавання, машыны і абсталяванне, паліва, тытунёвыя вырабы, тэкстыль, абутак, хімікаты, лекі. Знешні гандаль: экспарт 7,1 млн. дол., імпарт 58,1 млн. дол. (1999). Грашовая адзінка — пагангская паанга. Чыгунак няма. Аўтадарогі з цвёрдым пакрыццём 171 км (1999). Марскі порт — Нукуалофа. Аэрапорт у Фуамоту. Турызм.



Да арт. **Тонга**. У танганскай вёсцы.

балоўстве, 7,8% — у прам-сці і буд-ве, 7,3% — на транспарце і ў сувязі, 11% — у гандлі, рэстаранах і атэлях, 41,8% — у інш. абслуговых галінах. Гал. галіна — земляробства. Пад с.-г. ўгоддзямі 61,3 тыс. га, у т.л. пад ворывам 18 тыс. га, пад шматгадовымі насаджэннямі 38,8 тыс. га, пад пашай 4,5 тыс. га. Значная частка зямель належыць каралеўскай сям'і і спадчыннай арыстакратыі, якія здаюць яе ў арэнду сялянам. Пераважаюць гаспадаркі пл. да 3 га. Штогадовы збор асн. культур (тыс. т.): какосавых арэхаў — каля 125, бананаў — каля 5, батату — 80, маніёку — 12, апельсінаў — 3, памідораў — 2. Асн. экспартныя культуры — какосавыя арэхі і бананы, а таксама какава, кава, ваніль, імбір, чорны перац, цытрусавыя, арахіс, манга, ананасы. Асн. харч. культуры — батат, маніёк, ямс, тара, хлебнае дрэва, кукуруза, рыс, бахчавыя, агародніна. У краіне каля 6 тыс. галоў буйн. раг. жывёлы, 8 тыс. коней, 80 тыс. свіней, 10 тыс. коз. Птушкагадоўля (каля 270 тыс. курэй). Рыбалоўства (каля 2—3 тыс. т рыбы штогод). Прам-сць: лесапільныя з-ды і прадпрыемствы па перапрацоўцы с.-г. сыравіны, пашыве адзення, выпуску спарт. абсталявання, зборцы з імпартаваных дэталей і вузлоў міні-экскаватараў. Вытв-сць электраэнергіі 35 млн. кВт·гадз (1999). Развіты саматужныя рамёствы і промыслы: выраб нац. тканін і адзення, цыновак, сувеніраў. Транспарт аўтамаб. і марскі. Аўтадарог 680 км, у т.л. 184 км з цвёрдым пакрыццём, 3,4 тыс. легкавых, 3,6 тыс. грузавых аўтамабіляў і аўтобусаў (1996). Астравы злучаны паміж сабой рэйсамі невял. суднаў. Гал. порт Нукуалофа. 6 аэрапортаў, у т.л. міжнар. на в-ве Тангатапу. У 1998 экспарт склаў 8 млн. дол., імпарт — 69 млн. дол. У экспарце пераважаюць копра, бананы, кава, какава, ваніль, рыба, у імпарце — спажывецкія і харч. тавары, нафтапрадукты. Замежны турызм (у 1997/98 — 26,2 тыс. чал. пераважна з Новай Зеландыі, ЗША, Аўстраліі) і грашовыя пераводы грамадзян Т. з-за мяжы з'яўляюцца важнымі крыніцамі даходаў. Грашовая адзінка — паанга.

Літ.: Малаховский К.В. Под Южным Крестом. М., 1974.

ТО́НГА ЖО́ЛАБ (Tonga), глыбакаводны жолаб у Ціхім ак. Цягнеца ўздоўж усх. схілу аднайм. падваднага хрыбта ад а-воў Самоа да 25° паўд. ш. Даўж. 860 км. Сярэдняя шыр. 78 км. Глыб. 10 882 м (найб. глыбіня Сусветнага ак. ў Паўд. паўшар'і). На Пд пераходзіць у жолаб Кермадэк.

ТОН ДЫК ТХАНГ (Tôn Đú'c Thắng; 20.8.1888, прав. Лангсюен, В'етнам — 30.3.1980), в'етнамскі паліт. і дзярж. дзеяч. З 1912 жыў у Францыі. Служыў у франц. ВМФ, удзельнік паўстання франц. ваен. маракоў у Севастопалі ў 1919. Пасля вяртання ў 1920 у В'етнам удзельнічаў у антыкалан. руху, чл. Т-ва в'етн. рэв. моладзі. У 1929—45 зняволены ў франц. турму, дзе ў 1930 далучыўся да Камуніст. партыі Індакітая (з 1951 Партыя працоўных В'етнама, ППВ). Чл. ЦК ППВ з 1951. З 1949 нам., з 1955 старшыня Пастаяннага к-та Нац. сходу Дэмакр. Рэспублікі В'етнам (ДРВ). З 1960 віцэ-прэзідэнт ДРВ, у 1969—76 прэзідэнт ДРВ. З 1976 прэзідэнт Сацыяліст. Рэспублікі В'етнам. Міжнар. Ленінская прэмія «За ўмацаванне міру паміж народамі» 1955.

ТО́НЕЖ, вёска ў Лельчыцкім р-не Гомельскай вобл., на аўтадарозе Жыткавічы—Букча. Цэнтр сельсавета. За 53 км на З ад г.п. Лельчыцы, 260 км ад Гомеля, 72 км ад чыг. ст. Жыткавічы. 789 ж., 362 двары (2002). Лясніцтва. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, аптэка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан. Магілы ахвяр фашызму. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Каля вёскі *Тонежскае радовішча бурага вугалю.*

ТО́НЕЖСКАЕ РАДО́ВІШЧА БУ́РАГА ВУ́ГАЛЮ. У Лельчыцкім р-не Гомельскай вобл., паміж вёскамі Тонеж і Букча. Выяўлена ў 1982, папярэдне разведана ў 1987—90. Вугляносная тоўшча звязана з адкладамі ніжняга неагену і прымеркавана да Тонежскай дэпрэсіі Прыпяцкага прагіну. З 15 пластоў, лінз і прапласткаў практычнае значэнне маюць 3 пласты (I, II, III). Магутнасць іх 0,3—19,6 м, ускрышы (пясчана-гліністыя пароды) 26—132 м. Цеплата згарання 4—4,9 МДж/кг, попельнасць 22—34%. На пл. 10,3 км^2 папярэдне разведаныя запасы 42 млн. т. Радовішча не распрацоўваецца. *А.П.Шчураў.*

ТО́НІКА (ад франц. note tonique літар. — танічная нота), цэнтральны ўстойлівы элемент (устой) *танальнасці*: гал. ўстойлівы гук сістэмы (у мажоры і міноры I ступень *ладу*); асн. акорд лада (звычайна мажорнае ці мінорнае *трохгучча*), які будуецца на гал. устойлівым гуку. Усе інш. элементы лада маюць пэўную функцыю ў залежнасці ад гукавышынных суадносін з Т. — асновай гарманічнага працэсу. Т. дае назву ўсёй сістэме (до мажор, ля мінор). У музыцы 20 ст. Т. можа быць і дысанантны *акорд.* *Т.А.Дубкова.*

ТО́НКАЙ СТРУКТУ́РЫ ПАСТАЯ́ННАЯ, безразмерная фіз. велічыня, што характарызуе эл.-магн. ўзаемадзеянне элементарных часціц; адна з *фундаментальных фізічных пастаянных.* Вызначаецца формулай: $a = e^2/(\hbar c) \approx 1/137$, дзе e — *зарад элементарны*, $\hbar = h/(2\pi)$, h — *Планка пастаянная*, c — *скорасць святла* ў вакууме. Паводле найб. дакладных вымярэнняў $\alpha^{-1} = 137{,}0359895(61)$. Вызначае *тонкую структуру* ўзроўняў энергіі атама (велічыня расшчаплення прапарцыянальная α^2), з чым звязана назва самой канстанты.

ТО́НКАЯ СТРУКТУ́РА, мультыплетнае расшчапленне, расшчапленне *ўзроўняў энергіі* (а таксама *спектральных ліній*) атамаў і інш. атамных сістэм на 2 ці больш падузроўняў, выкліканае гал. чынам *спін-арбітальным узаемадзеяннем.* Характарызуецца *тонкай структуры пастаяннай* і выяўляецца ў атамных спектрах у выглядзе дублетаў, трыплетаў і мультыплетаў спектральных ліній. Гл. таксама *Звыштонкая структура.*

ТО́НУС (лац. tonus ад грэч. tonos напружанне, напружанне) у фізіялогіі, нармальны (нестамляльны) стан пастаяннага ўзбуджэння нерв. цэнтраў і працяглае напружанне мышцаў; забяспечвае аптымальны функцыян. стан органаў і тканак, падтрыманне пэўнага становішча цела ў прасторы. Т. нерв. цэнтраў падтрымліваецца аферэнтнымі нерв. імпульсамі, што бесперапынна паступаюць у ц.н.с. ад перыферычных рэцэптараў, і ўздзеяннем хім. раздражняльнікаў (напр., гармонаў, медыятараў), якія знаходзяцца ў крыві. Пасіўны мышачны Т. залежыць ад вязкаэластычных уласцівасцей мышцы, актыўны — ад колькасці мышачных валокнаў, што скарачаюцца пад уздзеяннем нерв. імпульсаў, якія ўзнікаюць у рухальных нейронах спіннога мозга. Іх актыўнасць падтрымліваецца і рэгулюецца імпульсамі, што паступаюць ад вышэйшых цэнтраў (напр., рэтыкулярнай фармацыі ствала мозга) і ад прапрыярэцэптараў, якія знаходзяцца ў мышцах. *С.С.Ермакова.*

ТО́ПКА, прыстасаванне для спальвання цвёрдага, вадкага або газападобнага паліва ў *катлах, полымных печах* і інш. Т. для цвёрдага паліва бываюць слаявыя (паліва спальваецца слоем на калясніковых рашотках) і камерныя (цыклонныя, у якіх здробненае паліва спальваецца ў газапаветраным віхры, і віхравыя, з віхравым рухам газаў у топачнай камеры). Вадкае (мазут) і газападобнае



Да арт. **Топка**. Схема топачных працэсаў: 1 — слаявога; 2 і 3 — камерных.

паліва спальваюць у камерных Т., якія выконваюцца ў выглядзе верт. прамавугольнай камеры, дзе паліва згарае ў струмені паветра (у факеле).

ТО́ПЧЫЕЎ Аляксандр Васілевіч (9.8.1907, с. Міхайлаўка Валгаградскай вобл., Расія — 27.12.1962), сав. хімік-арганік. Акад. АН СССР (1949), з 1958 яе віцэ-прэзідэнт. Скончыў Маскоўскі хіміка-тэхнал. ін-т (1930), дзе і працаваў. У 1938—41 праф. Маскоўскага тэхнал. ін-та харч. прам-сці. З 1940 у Маскоўскім нафтавым ін-це (у 1943—47



А.В.**Топчыеў**.

дырэктар), адначасова у 1947—49 нам. міністра вышэйшай адукацыі СССР і з 1958 дырэктар Ін-та нафтахім. сінтэзу АН СССР (цяпер Ін-т нафтахім. сінтэзу Рас. АН яго імя). Навук. працы па даследаванні нітравання, галагенавання, алкіліравання і полімерызацыі вуглевадародаў розных класаў, а таксама сінтэзе і даследаванні фіз.-хім. уласцівасцей крэмнійарган. злучэнняў. Ленінская прэмія 1962. Дзярж. прэмія СССР 1950.

Тв.: Избр. тр. [Т. 1—3]. М., 1965—66.

Літ.: А.В.Топчиев. М., 1964.

ТОР, Донар, у германа-скандынаўскай міфалогіі бог грому, буры і ўрадлівасці, асілак, які абараняе багоў і людзей ад волатаў і страшэнных пачвар. Паводле «Прароцтва вёльвы», Т. у апошняй бітве перад канцом свету забівае сусв. змея Ёрмунганда, але і сам гіне ад яго атрутных укусаў.

ТОР (ад лац. torus выпукласць), геаметрычнае цела, атрыманае вярчэннем *круга* вакол восі, якая ляжыць у плоскасці гэтага круга і не перасякае яго. Часам Т. называюць толькі паверхню гэтага цела. Паверхня S і аб'ём V Т. вылічваецца паводле формул $S = 4\pi^2 ar$, $V = 2\pi^2 ar^2$, дзе r — радыус круга, a — адлегласць цэнтра круга ад восі вярчэння.

ТОР, пазасістэмная адзінка ціску, тое, што *міліметр ртутнага слупа*. Названа ў гонар Э.*Тарычэлі*.

ТО́РА, гл. ў арт. *Пяцікніжжа*.

ТО́РА (Thoreau) Генры Дэйвід (12.7.1817, г. Конкард, штат Масачусетс, ЗША — 6.5.1862), амерыканскі пісьменнік. Скончыў Гарвардскі ун-т (1837). Зблізіўся з Р.У.*Эмерсанам*, прымкнуў да трансцэндэнталістаў. Друкаваўся з 1840. Філас. проза «Уолдэн, або Жыццё ў лесе» (1854) — рамант. рабінзанада пра жыццё чалавека ў свеце прыроды як магчымасць выратавання асобы ад цывілізацыі «спажывання». Аўтар памфлетаў «Грамадзянская непакорнасць» (1849), «Рабства ў Масачусетсе» (1854), прамоў у абарону неграў, дарожных нататак-дзённікаў, у т.л. кніг «Тыдзень на Конкардзе і Мерымаку» (1849), «Мэнскія лясы» (апубл. 1864), «Янкі ў Канадзе» (апубл. 1866), вершаў, перакладаў, неапубл. запісаў пра індзейцаў.

Тв.: Рус. пер. — Уолден, или Жизнь в лесу. 2 изд. М., 1980.

Літ.: Осипова Э.Ф. Генри Торо: Очерк творчества. Л., 1985. *Т.Я.Камароўская.*

ТО́РАС, другая назва гор *Таўр*.

«ТО́РБА СМЕ́ХУ», зборнік гумарыст. і сатыр. твораў (фацэцый) на польскай і бел. мовах. Складзены ў 1773—98 выкладчыкам бернардзінскага калегіума ў г. Сянно (Віцебская вобл.) К.*Жэрай*. Уключае 223 анекдатычныя пацешныя і павучальныя гісторыі, якія здарыліся на Піншчыне, Гродзеншчыне, Лепельшчыне, у Гродне, Драгічыне і інш. мясцовасцях Беларусі і Польшчы. Некаторыя маюць антыклерыкальны і антыпрыгонніцкі змест. Рукапіс выяўлены і апубл. ў 1893 З.Глогерам.

Публ.: Vorago rerum: Torba śmiechu. Warszawa, 1980. *А.В.Мальдзіс.*



Тор: r — радыус круга; a — адлегласць цэнтра круга ад восі вярчэння.

ТО́РБАЧНІК (Thlaspi), род кветкавых раслін сям. крыжакветных. 60 відаў. Пашыраны ва ўмераным поясе Еўразіі і Амерыкі. На Беларусі 3 віды Т.: альпійскі (Th. alpestre), занесены ў Чырв. кнігу, палявы (Th. arvense), пранізаналісты (Th. perfoliatum). Трапляюцца на палях, пустках, уздоўж дарог.

Адна- і шматгадовыя травяністыя расліны. Сцёблы прамастойныя, простыя або галінастыя. Прыкаранёвае лісце часта ў разетцы, ча-



Тор. Бронзавая статуэтка, знойдзеная ў Ісландыі. Каля 1000.





Торбачнік: 1 — альпійскі; 2 — палявы.

ранковае, суцэльнае, зубчастае ці хвалістае, сцябловае — сядзячае, вузкасэрцападобнае. Кветкі дробныя, белыя, сабраныя ў верхавінкавыя гронкападобныя суквецці. Плод — стручочак. Трава Т. палявога мае моцны часночны пах, у насенні да 30% алею. Лек., радзей харч. (салатныя, насенне для гарчыцы), дэкар. расліны, некат. пустазелле.

А.М.Скуратовіч.

ТО́РВАЛЬД КО́ДРАНСАН (Thorvalde Kodransson; ? — пасля 1002), ісландскі падарожнік і місіянер 10 ст., адзін з першых апосталаў хрысціянства ў Ісландыі. У час знаходжання ў Саксоніі прыняў хрысціянства. За спробу пашырыць яго на радзіме быў асуджаны да выгнання. Аднак у 1000 хрысціянства ў Ісландыі было прынята ў якасці афіц. рэлігіі. У гэты ж год Т.К. выправіўся ў Святую зямлю, адкуль вяртаўся дамоў праз Канстанцінопаль і Кіеў. Паводле ісландскай сагі, «памёр на Русі, недалёка ад Полацка (Palteskja) і пахаваны там на гары пры царкве св. Яна Хрысціцеля і людзі лічаць яго святым». Невял. сага (татра) «Пра Торвальда Вялікага Падарожніка» ўдакладняе гэтыя звесткі і дадае, што магіла Т.К. «пад высокай гарой у Дрофне (Drafn) пры царкве св. Яна», дзе ён нібыта заснаваў манастыр. Паводле той жа крыніцы, Т.К. быў накіраваны на Русь як афіцыйны прадстаўнік візант. імператара. Месцазнаходжанне «высокай гары ў Дрофне» дакладна не лакалізавана. Звесткі пра Т.К. пацвярджаюць існаванне ў 9—10 ст. цесных сувязей Полацка са Скандынавіяй.

А.В.Белы, В.Рыч.

ТО́РВАЛЬДСЕН (Thorvaldsen) Бертэль (13 або 19.11.1768 або 1770, Капенгаген — 24.3.1844), дацкі скульптар, адзін з буйнейшых еўрап. майстроў позняга *класіцызму*. Вучыўся ў АМ у Капенгагене (1781—93). У 1797—1838 працаваў у Неапалі і Рыме, дзе вывучаў ант. пластыку і творы Рафаэля. З 1825 прэзідэнт рымскай акадэміі св. Лукі, з 1833 прэзідэнт АМ у Капенгагене. Творы вылучаюцца строгай гармоніяй кампазіцыі, статычнасцю і стрыманасцю вобразаў, падкрэсленых віртуознай апрацоўкай мармуру: «Ясон» (1802—03), «Амур і Псіхея» (1807), партрэт графіні Е.А.Остэрман-Талстой (1815), «Ганімед корміць Зеўсавага арла» (1817). Выканаў грандыёзны рэльеф «Паход Аляксандра Македонскага» (1812, вілла Карлота), конную статую Станіслава Аўгуста Панятоўскага (1820—29; да 1920 стаяла ў Гомелі каля палаца І.Ф.Паскевіча), помнік Каперніку (1830, абодва ў Варшаве), надмагілле папы Пія VII у саборы св. Пятра ў Рыме (1824—31). Халодная адцягненасць і ідэалізацыя вобразаў зрабілі Т. лідэрам *акадэмізму* ў скульптуры 1-й пал. 19 ст.

ТО́РКІ, г у з ы, у з ы, качавыя цюркамоўныя плямёны, якія вылучыліся з племяннога аб'яднання агузаў. Да сярэдзіны 11 ст. выцеснілі печанегаў і пасяліліся ў паўд.-рус. стэпах. Як саюзнікі кіеўскага кн. Уладзіміра Святаславіча ўдзельнічалі ў 985 у паходзе на *Балгарыю Волжска-Камскую*. У 1060 разгромлены аб'яднанымі войскамі стараж.-рус. князёў. У 1116 частка Т. разам з печанегамі атрымала паражэнне ад полаўцаў і перасялілася на Русь. Т. рассяліліся ў бас. р. Рось (прыток Дняпра), дзе пабудавалі г. Торчаск; паступова яны перайшлі да аселасці і сталі займацца земляробствам. Т. удзельнічалі ў барацьбе супраць полаўцаў на баку стараж.-рус. князёў. Частка Т. аславянілася, астатнія асіміляваны полаўцамі.



Б.**Торвальдсен**. Партрэт графіні Е.А.Остэрман-Талстой. 1815.

ТО́РМАЗ (ад грэч. tormos адтуліна для цвіка, які затрымлівае вярчэнне кола), прыстасаванне, што стварае супрацiўленне руху для спынення, рэгулявання скорасці ці ўтрымання на месцы трансп. машын, а таксама рухомых дэталей машын-прылад.

Дзеянне Т. грунтуецца на пераўтварэнні кінетычнай энергіі руху ў цеплавую пры трэнні паміж элементамі. Найб. пашыраны Т. фрыкцыйныя, якія паводле канструкцыі рабочых элементаў падзяляюцца на калодачныя, дыскавыя, стужачныя і канічныя. Бываюць таксама Т. аэрадынамічныя, гідраўл. і электрадынамічныя. Выкарыстоўваюцца для рэгулявання скорасці руху.



Схема калодачнага **тормаза**: 1 — барабан; 2 — нерухомая вось; 3, 5 — калодкі; 4 — шарнір; P_1, P_2 — сілы, што дзейнічаюць на калодкі.

ТО́РМІС (Tormis) Вельё (7.8.1930, пас. Куусалу Хар'юскага пав., Эстонія), эстонскі кампазітар, фальклярыст. Нар. арт. Эстоніі (1975). Нар. арт. СССР (1987). Скончыў Маскоўскую кансерваторыю (1956). Працуе ў розных жанрах. Прапагандыст стараж. нар. песні, шырока спалучае рысы фальклору з разнастайнымі стылявымі сістэмамі сучаснай музыкі. Сярод твораў: опера «Лебядзіны палёт» (паст. 1965), балет-кантата «Эстонскія балады» (паст. 1980), творы для хору a capella, у т.л. «Кіхнускія вясельныя песні» (1959), «Эстонскія каляндарныя песні» (1967; 5 цыклаў), «Малюнкі прыроды» (1969), «Балада аб Маар'ямаа» (1972), «Закляцце жалеза» (1972; з шаманскім бубнам), «Латышскія бурдонныя песні» (1982) і інш., музыка да спектакляў драм. т-ра і кінафільмаў. Дзярж. прэміі Эстоніі 1970, 1972. Дзярж. прэмія СССР 1974.

Літ.: Бобыкина И. В.Тормис: Очерк жизни и творчества. М., 1989. *Т.А.Дубкова.*

ТО́РМЫШАЎ Юрый Іванавіч (н. 23.4.1937, г. Таганрог Растоўскай вобл., Расія), бел. вучоны ў галіне выліч. тэхнікі. Д-р тэхн. н. (1991), праф. (1992). Скончыў Разанскі радыётэхн. ін-т (1964). З 1969 у Ін-це тэхн. кібернетыкі АН Беларусі. З 1979 у Бел. ун-це інфарматыкі і радыёэлектронікі. Навук. працы па тэхн. сродках узаемадзеяння чалавека з ЭВМ і апрацоўцы графічнай інфармацыі. Распрацаваў спосабы фарміравання і сціскання бінарных графічных відарысаў, метады пёравага інтэрфейсу чалавека з ЭВМ.

Тв.: Методы и средства формирования шаговых траекторий. Мн., 1980 (разам з М.П.Федарэнкам); Технические средства машинной графики. Мн., 1987; Технические средства ЭВМ: Устройства ввода-вывода. Мн., 1991 (у сааўт.). *М.П.Савік.*

ТО́РНДАЙК (Thorndik) Сібіл (24.10.1882, г. Гейнсбара, Вялікабрытанія — 9.6.1976), англійская актрыса. Муз. адукацыю атрымала ў школе «Гілдхол-скул», тэатр. — у акадэміі Б.Грыта. На сцэне з 1904. З 1908 выступала ў трупах А.Э.Хорнімен і Ч.Фромана. У 1914, потым у розныя гады працавала ў т-ры «Олд Вік» і інш. т-рах Лондана. Валодала віртуозным акцёрскім майстэрствам, рамантычна прыўзнятым і быт. стылямі ігры. Сярод роляў: лэдзі Макбет («Макбет» У.Шэкспіра), Гекуба («Траянкі» Эўрыпіда), Іакаста («Цар Эдып» Сафокла), Іаана («Святая Іаанна» Б.Шоу) і інш.

Літ.: Друзина М. Сибил Торндайк. Л., 1972.

ТО́РНДАЙК (Thorndike) Эдуард Лі (31.8.1874, г. Уільямсберг, штат Масачусетс, ЗША — 9.8.1949), амерыканскі псіхолаг і педагог. Чл. Нац. АН ЗША. З 1904 праф. Калумбійскага ун-та і пед. каледжа ў Нью-Йорку. З 1924 адзін з рэдактараў час. «Journal of genetic psychology» («Часопіс генетычнай псіхалогіі»), з 1926 — «Genetic psychology monographs» («Манаграфіі генетычнай псіхалогіі»). У працы «Розум жывёл» (1898) Т., уяўляючы інтэлект жывёл як інструмент прыстасавання да навакольнага асяроддзя, сфармуляваў закон «спроб і памылак»: спробы, якія выпадкова былі ўдалымі, замацоўваюцца і ствараюць уражанне мэтанакіраваных паводзін. Яго праца «Педагагічная псіхалогія» (1903) зрабіла ўплыў на развіццё тэорыі навучання ў ЗША, у т.л. на канцэпцыі *праграмаванага навучання*. Ён распрацоўваў праблемы навыкаў, паводзінскай псіхалогіі, сфармуляваў «закон праектавання», «закон эфектаў», «закон гатоўнасці» і інш. Т. належыць серыя прац па псіхалогіі навучання арыфметыцы, алгебры, мове, чытанню. Ён распрацаваў уласную сістэму тэстаў для колькаснага вымярэння ўзроўню псіхічнага развіцця. Даследаванні Т. даюць падставу сцвярджаць, што ён падрыхтаваў узнікненне *біхевіярызму*.

ТОРС (ад італьян. torso), скульптурнае выяўленне тулава чалавека. Ант. Т. ўяўляюць сабой часткі статуй, якія захаваліся (напр., Бельведэрскі Т., 50 г. да н.э.). З 2-й пал. 19 ст. Т. стаў самаст. відам скульптурнай кампазіцыі, якая дазваляе пластычна выяўляць фіз. структуру чалавека.

ТО́РСХАЎН (Thorshavn), горад, адм. цэнтр Фарэрскіх астравоў, на в-ве Стрэймай. Каля 15 тыс. ж. (2001). Порт. Аэрапорт. Прам-сць: рыбаперапр., маш.-буд., тэкстыльная.

ТО́РУНЬ (Toruń), горад на Пн Польшчы, у Куяўска-Паморскім ваяводстве. Каля 210 тыс. ж. (2001). Вузел чыгунак і аўтадарог. Порт на р. Вісла. Прам-сць: хім., маш.-буд., харч., шарсцяная, швейная, паліграфічная. Ун-т М.Каперніка, яго дом-музей.



Да арт. **Торунь**. Дом-музей М.Каперніка.

Засн. ў 1231 крыжакамі Тэўтонскага ордэна. У 1232 атрымаў гар. права. У 1264 непадалёку ад Т. засн. Новы горад, у 1454 абедзве гар. часткі аб'яднаны. Значны гандл. цэнтр, чл. сярэдневяковай *Ганзы*. З 1454 у складзе Польшчы. Радзіма М.*Каперніка*. Тут падпісаны Тарунскія мірныя дагаворы 1411 (завяршыў *Вялікую вайну 1409—11* з удзелам ВКЛ) і 1466 (скончыў *Трынаццацігадовую вайну 1454—66*). З канца 16 ст. асяродак лютэранства. З 1793 горад у Прусіі (акрамя 1807—15, калі ён уваходзіў у *Варшаўскае герцагства*), яе значная памежная крэпасць. З 1920 у Польшчы, важны ваенна-рачны порт (гал. база Вісліньскай флатыліі польскіх ВМС). У 2-ю сусв. вайну далучаны да Германіі. З 1945 зноў у складзе Польшчы, у 1975—99 адм. ц. Тарунскага ваяводства.

Захаваліся руіны замкаў 13—15 ст. У раёнах Старога горада і Новага горада рэшткі гар. умацаванняў, ратуша (13 ст. — 1603), гатычныя касцёлы св. Яна (каля 1250 — 15 ст.), св. Якуба (1309—15), Дзевы Марыі (1350—70), гатычныя і барочныя збожжасховішчы (14—17 ст.), дамы ў стылях готыкі, рэнесансу і барока. Вылучаюцца грамадскія пабудовы ў духу эклектыкі (ун-т, пач. 20 ст., неаготыка), стылю мадэрн і функцыяналізму. Помнік Каперніку (1853).

ТОРФ (ням. Torf), гаручы карысны выкапень. Утвараецца ў працэсе натуральнага адмірання і няпоўнага распаду раслін ва ўмовах недахопу кіслароду і залішняга ўвільгатнення. З'яўляецца шматкампанентнай, поліфракцыйнай паўкалоідна-высокамалекулярнай сістэмай, у складзе якой розныя класы арган. і мінер. злучэнняў.

Хім. састаў Т. вызначаецца ўмовамі генезісу, асаблівасцямі раслін-торфаўтваральнікаў і ступенню іх распаду. Яго элементарны састаў (на арганічную масу): вуглярод 50—60%, вадарод 5—7%, кісларод 26—45%, азот 0,9—3,6%, сера 0,1—5,9%. У кампанентным складзе арган. масы водараствaральных рэчываў 1—5%, бітумаў 2—17%, злучэнняў, якія лёгка гідралізуюцца, 20—40%, цэлюлозы 4—10%, гумінавых кіслот 10—50%, лігніну 5—20%. Попельнасць у памеры 50% на сухое рэчыва ўмоўна лічаць мяжой паміж Т. і тарфяной глебай. Паводле ступені распаду расл. тканак адрозніваюць Т. слаба- (да 20% рэчыва страціла клетачную структуру), сярэдне- (20—35%) і моцнараскладзены (больш за 35%). Цеплата згарання Т. 19,1—27,6 МДж/кг (4500—6500 ккал/кг). Вільгацеўтрыманне ў натуральным заляганні 88—96%, порыстасць да 96—97%, высокі каэфіцыент сціскальнасці. Тэкстура аднародная, зрэдку слаістая; структура валакністая або пластычная. Колер жоўты, буры да чорнага. У сухім стане мае малую шчыльнасць (да 300 кг/м^3), нізкі каэфіцыент цеплаправоднасці і высокую газапаглынальную здольнасць. У залежнасці ад складу раслін-торфаўтваральнікаў і ўмоў торфаўтварэння вылучаюць тыпы Т. — нізінны (попельнасць 1—18%, кіслотнасць pH > 5,1, азоту 2,8%), пераходны (попельнасць 1,2—15,9%, кіслотнасць pH 2,8—5,9, азоту да 2%) і вярховы (попельнасць 0,7—15,4%, кіслотнасць pH 2,8—3,6, азоту да 1,5%; гл. *Вярховае балота, Нізіннае балота, Пераходнае балота*); падтыпы — лясны, лесабагнавы, багнавы; групы і віды.

На Беларусі асн. віды Т.: асакова-гіпнавы, асакова-сфагнавы нізінны і пераходны, драўнінна-сфагнавы пераходны, драўнінны нізінны, комплексны вярховы, сфагнавы нізінны і пераходны, трысняговы нізінны, хваёва-падвейны, шэйхцэрыевы вярховы, нізінны і пера-



Гістарычны цэнтр г. **Торунь**.



Торф.

ходны, фускум-торф. Узрост 4—12 тыс. гадоў (трапляецца больш стараж. эпох). Утварае тарфяныя паклады. Разведана 9191 радовішча агульнай пл. каля 2,4 млн. га; да пачатку распрацоўкі запасы складалі больш за 5,7 млрд. т; геал. запасы, што засталіся, 4,3 млрд. т, у т.л. тыя, што здабываюцца, 0,21 млрд. т (2002). Выкарыстоўваецца як паліва, для вытв-сці арган. і арганамінер. угнаенняў, роставых рэчываў, біястымулятараў і меліярантаў, кармавых дражджэй і вугляводных дамешкаў, фільтраў, сарбентаў і фарбавальнікаў драўніны, тарфянога воску, лекавых сродкаў, прадуктаў для быт. хіміі і паліграфіі, на подсціл жывёле і інш. Многія тарфяныя радовішчы вярховага тыпу абвешчаны заказнікамі, запаведнікамі, рэзерватамі бітумінознай і гідролізнай сыравіны. Значная плошча тарфяных радовішчаў асушана і выкарыстоўваецца ў якасці меліяраваных глеб. Вывучаюць Т. у Ін-це праблем выкарыстання прыродных рэсурсаў і экалогіі Нац. АН Беларусі, НДІ меліярацыі і лугаводства, НДІ глебазнаўства і аграхіміі і інш. н.-д. установах. Гл. таксама *Балотазнаўства, Балотныя адклады, Тарфяная прамысловасць, Торфалячэнне* і інш.

Літ.: Лиштван И.И., Король Н.Т. Основные свойства торфа и методы их определения. Мн., 1975; Пидопличко А.П. Торфяные месторождения Белоруссии. Мн., 1961; Тановицкий И.Г. Рациональное использование торфяных месторождений и охрана окружающей среды. Мн., 1980.

І.І.Ліштван.

ТОРФАЗДАБЫ́ЧА, сукупнасць аперацый па здабычы *торфу*, яго перапрацоўцы, сушцы і ўборцы з дапамогай *тарфяных машын і комплексаў*.

Звесткі пра здабычу «гаручай зямлі» для награвання ежы ёсць у Плінія Старэйшага (1 ст. н.э.). У 12—13 ст. Т. вялася ў Шатландыі, Галандыі, у сярэдзіне 17 ст. на Украіне, з канца 17 ст. — у Расіі. Напачатку Т. вялі ўручную: торф рэзалі спец. лапатамі (разакамі) на цагліны, якія сушылі на паветры. У 2-й пал. 19 ст. вынайшлі элеватарны спосаб: здабыты торф спец. элеватарнымі машынамі перамяшчалі з кар'ера, перамешвалі і фармавалі ў цагліны. У 1914 інжынер-электратэхнік Р.Э.Класон распрацаваў гідраўл. спосаб Т. («гідраторф»), пры якім тарфяны масіў размывалі струменем вады з *гідраманітора*, атрыманую масу перапампоўвалі па трубаправодах на спец. палі, дзе яе сушылі. З 1920-х г. укаранялі экскаватарны спосаб Т.: радовішча на ўсю глыбіню распрацоўвалі многакаўшовымі экскаватарамі, тарфяную масу высцілалі паралельнымі стужкамі, раздзеленымі на цагліны, якія сушылі, пераварочвалі і складвалі ў штабелі. З 1940-х г. развіваецца фрэзерны (паверхнева-паслойны) спосаб Т., які ўключае аперацыі фрэзеравання (здрабнення) паверхневага слоя радовішча, варушэння (сушкі) яго, валкавання (укладкі ўборачнымі машынамі ў навалы), штабелявання (складвання штабелявальнымі машынамі ў штабелі). Торф выкарыстоўваўся ў асн. як паліва — бытавое і для цеплавых электрастанцый. З 1960-х г. развіваецца с.-г. выкарыстанне торфу і прадуктаў яго тэрмахім. перапрацоўкі. У канцы 20 ст. ў сувязі з ростам здабычы вугалю, нафты, газу Т. значна скарацілася.

На Беларусі Т. пачалася ў 1896 пры шклозаводзе ў в. Серкавіца (Талачынскі р-н Віцебскай вобл.), дзе торф выкарыстоўваўся ў газагенератарах, а ў 1899 каля Гомеля для патрэб цагельняў, з 1900 каля в. Шэбрын (Брэсцкі р-н) выраблялі торфабрыкеты. Да 1913 Т. пачалася каля Віцебска, Магілёва, Мінска, у Гомельскім і Полацкім р-нах. У перадваенныя гады дзейнічала больш за 200 торфапрадпрыемстваў. У 1950—60-я г. пабудаваны дзесяткі буйных торфапрадпрыемстваў. Да 1960-х г. на торфе працавала большасць ДРЭС і ЦЭЦ. З канца 1970-х г. здабыча торфу на паліўна-энергет. мэты зменшылася. Гл. таксама *Тарфяная прамысловасць*.

Літ.: Богатов Б.А., Никифоров В.А. Технология и комплексная механизация торфяного производства. Мн., 1988.

Б.А.Багатаў, У.М.Сацута.

ТОРФАЛЯЧЭ́ННЕ, ужыванне *торфу* на лек. мэты; від *гразелячэння*. Як лек. сродак торф выкарыстоўваюць з 1-й пал. 19 ст. Лек. торфы складаюцца са згнілых расл. і жывёльных рэшткаў, валодаюць процімікробным, антыакісляльным, процізапаленчым, раназагойвальным і інш. дзеяннямі. Праводзіцца ў гразелячэбніцах. Выкарыстоўваецца пры захворваннях і выніках траўмаў апорна-рухальнага апарату, нерв. сістэмы, хваробах скуры, палавых органаў, дыхальнай сістэмы і інш.

І.М.Семяненя.

ТО́РЫ (англ. tory), палітычная партыя ў Вялікабрытаніі ў канцы 17 — сярэдзіне 19 ст. Узнікла ў 1670—80-я г. як групоўка прыхільнікаў *абсалютызму*, да сярэдзіны 18 ст. канчаткова склалася як партыя зямельнай арыстакратыі і вярхоў духавенства, разам з *вігамі* стала адной з 2 вядучых партый брыт. *двухпартыйнай сістэмы*. З 1780-х г. да 1830 прадстаўнікі Т. няспынна панавалі ў парламенце і ўзначальвалі ўрады краіны. Становішча Т. падарвалі хлебныя законы 1815 і праведзеная ў 1832 вігамі парламенцкая рэформа, якая дала доступ у парламент прамысл. буржуазіі. У выніку вострай унутрыпарт. барацьбы ў сярэдзіне 19 ст. старая партыя Т. фак-



1



2



3

Аперацыі фрэзернага спосабу **торфаздабычы**: 1 — варушэнне; 2 — валкаванне; 3 — уборка валкоў уборачнай машынай МТФ-41.

тычна распалася, на яе аснове сфарміравана *Кансерватыўная партыя Вялікабрытаніі*, за членамі якой захавалася неафіц. назва «торы».

ТО́РЫЕВЫЯ РУ́ДЫ, прыродныя мінер. ўтварэнні для прамысл. здабычы *торыю*. Вядома больш за 120 торыевых і торыйзмяшчальных мінералаў. Гал. прамысл. мінералы: *манацыт* (3,5—10% ThO_2), тарыт (да 77%), тарыяніт (45—93%). Гал. крыніца торыю — манацытавыя прыбярэжна-марскія россыпы. Т.р. пераважна комплексныя, маюць у сабе рэдказямельныя элементы, уран, ніобій, тытан, цырконій і інш. Торый здабываецца таксама спадарожна з *уранавых руд* і руд інш. металаў. Паходжанне эндагеннае (радовішчы карбанатытавыя, пегматытавыя, гідратэрмальныя і інш.), экзагеннае (россыпы) і метамарфагеннае. Радовішчы ў Індыі, Бразіліі, Інданезіі, Аўстраліі, ЗША, Расіі і інш.

ТО́РЫЙ (лац. Thorium), Th, радыеактыўны хім. элемент III групы перыяд. сістэмы, ат. н. 90, ат. м. 232,038, адносіцца да *актыноідаў*. Вядомы ізатопы з масавымі лікамі 213—236. У прыродзе пашыраны ^{232}Th — найб. доўгажывучы радыенуклід (перыяд паўраспаду $1{,}405 \cdot 10^{10}$ гадоў, α-выпраменьвальнік), роданачальнік натуральнага *радыеактыўнага рада*. У зямной кары $8 \cdot 10^{-4}$% па масе. Вядома каля 120 мінералаў; прамысл. руда — *манацыт*. Адкрыты ў 1828 Ё.Я.*Берцэліусам*; назва ад імя бога грому ў сканд. міфалогіі — Тора. Радыеактыўнасць Т. ўстанавілі ў 1898 М.*Складоўская-Кюры* і незалежна ад яе ням. хімік Г.Шміт.

Серабрыста-белы пластычны метал, $t_{пл}$1750 °С, $t_{кіп}$ 4200 °С, шчыльн. 11724 кг/м^3. Кампактны Т. у паветры цьмянее (пакрываецца ахоўнай аксіднай плёнкай), пры t>400 °С хутка акісляецца да дыаксіду ThO_2 (бясколернае крышт. рэчыва, $t_{пл}$ 3350 °С, хімічна вельмі ўстойлівы), парашкападобны — пірафорны. Павольна ўзаемадзейнічае з разбаўленымі плавікавай, азотнай (канцэнтраванай пасівіруецца), сернай к-тамі, хутка раствараецца ў канцэнтраванай салянай кіслаце. Пры награванні з вадародам утварае гідрыд ThH_2, з вугляродам — мона- і дыкарбід, з галагенамі — тэтрагалагеніды. Метал. Т. атрымліваюць аднаўленнем ThO_2 кальцыем пры 900—1000 °С, электролізам тэтрафтарыду ThF_4 і калію пентафторатарату(IV) $KThF_5$ у расплаве галагенідаў шчолачных металаў. Выкарыстоўваюць метал. Т. для легіравання розных сплаваў, як гетэр пры вырабе электралямпаў, ThO_2 як вогнетрывалы матэрыял, кампанент каталізатараў, ядз. паліва ва уран-торыевых рэактарах, у якіх ^{232}Th ператвараецца ва ^{233}U. Таксічны, ГДК 0,05 мг/м^3.

Літ.: Популярная библиотека химических элементов. Кн. 2. 3 изд. М., 1983.

ТО́РЫК Мікалай Антонавіч (15.3.1906, в. Перавоз Капыльскага р-на Мінскай вобл. — 15.4.1999), віцэ-адмірал (1957). Скончыў Ленінградскія вышэйшыя ваенна-паліт. курсы (1931), акадэміі Ваенна-палітычную (1937) і Генштаба (1952). У Чырв. Арміі з 1928, з 1937 у ВМФ: памочнік, нам. нач. палітупраўлення. З 1940 і ў Вял. Айч. вайну нач. палітупраўлення Паўн. флоту. Пасля вайны да 1966 узначальваў палітупраўленні Паўн., Чарнаморскага і Балт. флатоў. *Б.Дз.Далгатовіч.*

ТО́РЭНС (Torrens), бяссцёкавае салёнае возера на Пд Аўстраліі; 2-е па велічыні на мацерыку пасля воз. Эйр. Размешчана ў катлавіне тэктанічнага паходжання, на 3 ад хр. Фліндэрс, на выш. 34 м. Пл. зімой да 5,7 тыс. км^2 (глыб. да 8 м), летам амаль перасыхае, дно ўкрываецца скарынкай солі.

ТО́РЭС (Torres) Луіс Ваэс дэ (1560—1614?), іспанскі мараплавец. У 1605 удзельнічаў у экспедыцыі П.Кіроса, якая на 3 караблях выйшла з Перу на пошукі легендарнага Паўд. мацерыка. Экспедыцыя адкрыла асобныя а-вы з груп Туамоту і Новыя Гебрыды, якія Кірос прыняў за Паўд. мацярык, і на адным з караблёў таемна вярнуўся ў Амерыку. Т. даследаваў астравы, потым павярнуў на З, перасек Каралавае м., адкрыў паўд. бераг Новай Гвінеі, праліў паміж ёй і Аўстраліяй (у 1799 названы яго імем) і прыбыў на Філіпіны. Яго імем названа таксама група астравоў у паўн. ч. Новых Гебрыдаў.

ТО́РЭСА ПРАЛІ́Ў (Torres Strait), праліў паміж в-вам Новая Гвінея і п-вам Кейп-Йорк (Аўстралія). Злучае Індыйскі (Арафурскае м.) і Ціхі (Каралавае м.) акіяны. Даўж. 74 км, шыр. 150—240 км, найменшая глыб. на фарватэры 7,4 м. Шмат астравоў, скал, рыфаў, што перашкаджае суднаходству. Моцныя прыліўныя цячэнні. Названы імем іспанскага мараплаўца Л.В.*Торэса*.

ТО́СА, сяродневяковая нац. японская школа жывапісу, якая развівала традыцыі школы *Ямата-э*.

ТОТ, Джэхуці, у старажытнаегіпецкай рэлігіі і міфалогіі адзін з найгалоўнейшых багоў, бог Месяца, часу, мудрасці, ліку, пісьма. Яго найчасцей уяўлялі ў выглядзе чалавека з галавой птушкі ібіс (свяшчэнная істота Т.) і прыладамі для пісьма ў руках. Лічыўся стваральнікам усяго інтэлектуальнага жыцця, апекуном пісцоў, архіваў, бібліятэк. Паводле ўяўленняў егіпцян, Т. вёў лік дням, месяцам, гадам (наз. «ўладаром часу»), запісваў дні нараджэння і смерці людзей, вёў летапісы.

ТО́ТЫЛА (Totila), Баду і ла (?—552), кароль *остготаў* у Італіі [541—552]. Узначаліў барацьбу остготаў супраць *Візантыі*, якая імкнулася завяваць остготскае каралеўства ў Італіі. Залучаў у сваё войска беглых рабоў і *калонаў*, даваў ім свабоду; канфіскоўваў землі рым. арыстакратыі і хрысціянскай царквы, раздаваў іх сваім воінам. Атрымаў шэраг перамог над візант. войскамі: у 546 узяў Рым, адваяваў б.ч. Італіі, Сіцылію, Сардзінію і Корсіку. У 552 у бітве каля Тагіна армія Т. разгромлена, а ён смяротна паранены.

ТО́ЎКАЧ Анатоль Іларыёнавіч (н. 10.7.1929, в. Засялечча Асіповіцкага р-на Магілёўскай вобл.), бел. мастак. Вучыўся ў Кастрамскім маст. вучылішчы (1951—54). Працуе ў станковых жывапісе і графіцы (акварэль, гуаш), пераважна ў жанры гар. пейзажа. Творам уласцівы панарамная манументальнасць, распрацаваная кампазіцыйная будова. Сярод твораў: «Родны кут» (1957), «Горад жыве» (1960), «Магілёўская шаша» (1963), «Растуць новыя кварталы» (1965), «Цішыня» (1974), «Начны дазор» (1975), «Ільны Браслаўшчыны» (1976), «Віцебская панарама» (1980), «Працоўны дзень» і «Панарама Віцебска» (абодва 1990), «Стары Віцебск» (1991), «Стары Полацк» (1992), «Свята-Успенскі сабор Віцебска» (2000), «Здраўнёва» (2002). *І.Л.Чэбан.*



Тот. З малюнка ў «Кнізе мёртвых» прынцэсы Несітанебташру. Каля 970 да н.э.

ТОЎСТАГАЛО́ЎКІ (Hesperiidae), сямейства дзённых матылёў. Каля 3,5 тыс. відаў. Пашыраны на ўсіх кантынентах. На Беларусі 11 відаў. Найб. трапляюцца: Т. ружакветная (Pyrgus, або Hesperia, malvae), Т.-коска (Erynnis, або Hesperia, comma), разнакрылка-марфей (Heteropterus morpheus) і інш.

Размах крылаў да 7 см. Галава (адсюль назва) і тулава тоўстыя. Паміж булавападобнымі вусікамі валасяны чубок. На пярэдніх крылах усе 5 радыяльных жылак адыходзяць ад пасярэдняй ячэйкі. Матылі кормяцца нектарам кветак. Вусені патоўшчаныя, часам верацёнападобныя; жывуць паміж сплеценага ліста або адкрыта; кормяцца лісцем травяністых раслін (пераважна ружакветных і злакавых).

С.Л.Максімава.

ТО́ЎСТЫ Віктар Пятровіч (6.6.1914, в. Літавец Дзяржынскага р-на Мінскай вобл. — 13.6.1993), генерал-лейтэнант войск сувязі (1965). Скончыў Ленінградскае ваен. вучылішча сувязі (1937), Ваен. электратэхн. акадэмію сувязі (1941). У Чырв. Арміі з 1934. У Вял. Айч. вайну з ліп. 1941 на Ленінградскім, Данскім, Варонежскім, Сцяпным, 2-м і 3-м Укр. франтах: нач. штаба асобнага палка сувязі, нач. сувязі стралк. корпуса. Удзельнік баёў пад Ленінградам, Сталінградам, на тэр. Малдовы, Румыніі, Венгрыі, Югаславіі, Аўстрыі. Да 1974 на адказных пасадах у Сав. Арміі.



П.Ф.Тоўсцікаў.

ТО́ЎСЦІК Уладзімір Антонавіч (н. 24.6.1949, Мінск), бел. мастак. Засл. дз. маст. Беларусі (1990). Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1972). З 1976 выкладае ў Бел. АМ (з 1996 праф., з 2001 заг. кафедры). Творчай манеры Т. ўласцівы свабоднае і вобразнае спалучэнне рэаліст. трактоўкі вобразаў з арыгінальнымі формамі і сродкамі рамантызму, сімвалізму, мадэрна. Часта выкарыстоўвае калажны прынцып кампазіцыі, востры і артыстычны малюнак спалучае са свабоднымі жывапіснымі плямамі і фактурнымі эксперыментамі. Творы вылучаюцца разнастайнасцю тэматыкі, дзе сучаснасць звязваецца з гісторыяй, інтымны свет з прыродным навакольлем, бел. рэаліі з заходнееўрапейскімі. У 1970—80-я г. звяртаўся да гераіка-патрыят. і нац. праблематыкі: «Песня. Дакрананне» (1980), «А сэрца ўсё імкне да бацькоўскага краю... (М.Багдановіч)» (1981), «Год 1913, 9 лютага. Пецярбургская прэм'ера» (1982), «І проста лягу пад белы снег... Памяці У.Караткевіча» (1986) і інш. З 1990-х г. стварае шматзначныя сінт. кампазіцыі алегарычнага характару, дзе часта вял. ролю адыгрываюць вобразы рамант. пачуццёвых жанчын: «Малітва» (1990), «Успамін аб Эладзе» (1992), «Жарт» (1993), «Серабро і золата» (1994), «На сцэне. Прэм'ера», «Восеньская казка», «Жанчыны, кветкі і птушкі», «Галасы мінулага», «Мелодыя для флейты» (усе 1995), «На Каляды ў Венецыі» (1996), «Вечны вершнік», «Цырк. Жанчына-воблака», «Цыганскі кароль» (усе 1997). Аўтар серыі «Святло і цені» (1993; Дзярж. прэмія Беларусі 1994). Прэмія Ленінскага камсамола Беларусі 1982. *Я.Ф.Шунейка.*



У.**Тоўсцік**. Цырк. Жанчына-воблака. 1997.



Тоўстагалоўкі: 1 — разнакрылка-марфей; 2 — коска (а — дарослая асобіна; б — вусень); 3 — ружакветная.

ТО́ЎСЦІКАЎ Павел Фёдаравіч (26.10.1904, г. Барысаў Мінскай вобл. — 24.4.1985), Герой Сав. Саюза (1945), генерал-маёр (1945). Скончыў Кіеўскую пях. школу (1930), курсы ўдасканалення афіцэрскага саставу (1949), Вышэйшыя акад. курсы пры Акадэміі Генштаба (1953). У Чырв. Арміі з 1926. У Вял. Айч. вайну з 1941 на Цэнтр., Зах., Бранскім, 1-м Прыбалт., 3-м Бел. франтах: нач. аператыўнага аддзела штаба дывізіі, нам. нач. аператыўнага аддзела штаба арміі, нач. штаба стралк. дывізіі, корпуса, камандзір дывізіі. Дывізія на чале з палк. Т. вызначылася летам 1944 пры вызваленні Барысава, Мінска, у 1945 у баях за Кёнігсберг і Пілаў. Да 1957 у Сав. Арміі і цэнтр. апараце Мін-ва абароны СССР. Ганаровы грамадзянін г. Барысаў.

ТО́ФЛЕР (Toffler) Алвін (н. 4.10.1928, Нью-Йорк), амерыканскі філосаф, сацыёлаг, футуролаг. З 1969 праф. Корнелскага ун-та, потым Новай школы сац. даследаванняў у Нью-Йорку, дзе выкладаў сацыялогію будучыні (вёў адзін з першых такіх семінараў у свеце). У працах «Шок будучыні» (1970), «Трэцяя хваля» (1980), «Метамарфозы ўлады» (1990) прааналізаваў тэндэнцыі і супярэчнасці гіст. эвалюцыі. Паводле Т., у развіцці чалавецтва вылучаюцца 3 цывілізацыйныя хвалі: д а і н д у с т р ы я л ь н а я — аграрная цывілізацыя (да 1650—1750), заснаваная на простым падзеле працы, класавай структуры грамадства, аўтарытарнай уладзе і дэцэнтралізаванай эканоміцы; і н д у с т р ы я л ь н а я — прамысл. цывілізацыя, якая прывяла да канфлікту паміж прыроднымі і сацыякульт. аспектамі чалавечага існавання, шматлікіх рэвалюцый, контррэвалюцый і войнаў 2-й пал. 18—20 ст.; п о с т і н д у с т р ы я л ь н а я — камп'ютэрна-інфармацыйная цывілізацыя (з 2-й пал. 20 ст.), якая выклікана нарастаючым і паўсюдным выкарыстаннем камп'ютэраў, лазернай тэхнікі, біятэхналогіі, геннай інжынерыі, электронікі, тэле- і відэакамунікацый, пастаянным абнаўленнем энергет. рэсурсаў і інтэлектуальнага патэнцыялу грамадства. Да контураў гэтай новай, «першай сапраўды гуманнай цывілізацыі ў вядомай нам гісторыі» Т. адносіць таксама шырокае выкарыстанне інфарм. (гнуткіх) тэхналогій, дэмакратыю і плюралізм як аснову функцыянавання ўсіх сфер жыццядзейнасці людзей, пераход ад нац.-дзярж. замкнёнасці і самаўзвышэння да агульных рынкаў са свабодным перамяшчэннем тавараў, людзей, ідэй, культуры. На яго думку, у інфарм. грамадстве веды становяцца не толькі найважнейшым рэсурсам перадавой эканомікі, але і найб. эфектыўнай крыніцай і інструментам улады; перазмеркаванне ведаў і інтэлектуальных рэсурсаў — неабходная перадумова жыццяздольнасці сучаснай цывілізацыі. Многія прагнозы Т. на бліжэйшую перспектыву спраўдзіліся, напр., прадказанні пра ўзмацненне процістаяння паміж багатымі і беднымі рэгіёнамі свету (Поўнач—Поўдзень, Амерыка—Азія), абвастрэнне праблем урбанізацыі, расавых, міжнац. і міжрэліг. канфліктаў і інш. Аўтар прац «Культурныя спажыўцы» (1973), «Даклад аб экаспазме» (1975), «Папярэднія нататкі і перспектывы» (1983), «Успрымальная карпарацыя» (1985) і інш.

Тв.: Рус. пер. — Третья волна. М., 1999; Метаморфозы власти: Знание, богатство и сила на пороге XXI в. М., 2002; Шок будущего. М., 2002. *С.Ф.Дубянецкі.*

ТО́ШЧЫЦКІ БОЙ 1943, бой партызан па разгроме ням.-фаш. гарнізона на чыг. ст. Тошчыца Быхаўскага р-на Магілёўскай вобл. на лініі Магілёў—Жлобін 5 вер. ў Вял. Айч. вайну. Буйны гарнізон, умацаваны дзотамі, драцянымі

загародамі, кулямётнай вышкай, ахоўваў участак ракаднай чыгункі ў тыле групы ням. армій «Цэнтр». Да раніцы 5 вер. 7 атрадаў партызан Барысаўскай ваенна-аператыўнай групы з З і У акружылі станцыю і ў светлы час сутак раптоўным ударам падавілі агнявыя кропкі праціўніка, падарвалі вышку. У ходзе бою яны ўзарвалі вадакачку, рэйкі, лесапільны з-д, спалілі эшалон, забралі трафеі і арганізавана адышлі. Чыгунка на ўчастку не дзейнічала 72 гадз.

У.С.Пасэ.

ТРА́БСКАЯ СУКО́ННАЯ МАНУФАКТУ́РА. Дзейнічала ў 1806—54 у мяст. *Трабы* Ашмянскага пав. (цяпер вёска ў Іўеўскім р-не Гродзенскай вобл.). Вырабляла сукно салдацкае, тонкае, мерыносавае, байку, коўдры і гунькі. Размяшчалася ў 9 драўляных будынках. Мела вадзяны рухавік, фарбавальню і сукнавальню; у 1823—28 мела 36 ткацкіх станкоў, 6 часальных, 6 стрыгальных, 3 прадзільныя машыны; працаваў 221 прыгонны селянін. У 1824 выраблена 25 тыс. аршынаў сукна.

ТРА́БСКІ КАСЦЁЛ, помнік архітэктуры неаготыкі ў в. Трабы Іўеўскага р-на Гродзенскай вобл. Пабудаваны ў 1900—05 з цэглы. Двухвежавы прамавугольны ў плане храм з 5-граннай апсідай і невял. трансептам. Асн. аб'ём накрыты 2-схільным дахам, 3-ярусныя вежы — высокімі шатрамі. Крылы трансепта прылягаюць адначасова да асн. аб'ёму і апсіды, накрыты 2-схільнымі дахамі, якія з трох бакоў накрыты шчытамі. Сцены рытмічна расчлянёны контрфорсамі і стральчатымі аконнымі праёмамі.

Т.В.Габрусь.



Трабскі касцёл.

ТРАБУ́ХІНА Раіса Васілеўна (н. 27.1.1930, Ташкент), бел. вучоны ў галіне біяхіміі. Д-р біял. н. (1985), праф. (2001). Скончыла Мінскі мед. ін-т (1955). З 1960 у Гродзенскім мед. ін-це, з 1975 у Ін-це біяхіміі Нац. АН Беларусі (у 1987—2002 заг. лабараторыі). Навук. працы па вывучэнні метабалізму водарастваральных вітамінаў пры эксперым. канцэрагенезе, біяхім. рэзістэнтнасці арганізма пры сумесным уздзеянні радыяцыі і тэхнагенных фактараў.

Тв.: Изменение показателей пентозофосфатного пути у больных туберкулезом в условиях длительного воздействия низких доз радиации (у сааўт.). // Весці АН Беларусі. Сер. біял. навук. 1997. №3; Обмен витамина B_1 у норок в различные биологические периоды и фазы роста щенков (у сааўт.). // Проблемы экологической физиологии пушных зверей. Петрозаводск, 2000. Вып. 2.

ТРА́БЫ, вёска ў Іўеўскім р-не Гродзенскай вобл., на р. Клява, на аўтадарозе Юрацішкі—Ашмяны. Цэнтр сельсавета і аграфірмы-калгаса. За 34 км на ПнУ ад г. Іўе, 185 км ад Гродна, 11 км ад чыг. ст. Юрацішкі. 816 ж., 355 двароў (2002). Філіял сумеснага прадпрыемства «Рэлоіз Бел». Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, паліклініка, аптэка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан. Помнікі архітэктуры: Петрапаўлаўская царква (1784), *Трабскі касцёл*.

З 1490 належала Гаштольдам, з 1543 — Радзівілам, з 1569 — каралю Рэчы Паспалітай, з 1766 — Зянковічам. У 1784 пабудавана царква. Да 1795 цэнтр гміны ў Валожынскім пав. Навагрудскага ваяв. Пасля 3-га падзелу Рэчы Паспалітай (1795) у Рас. імперыі, мястэчка ў Ашмянскім пав. Віленскай губ. У 1806—54 дзейнічала *Трабская суконная мануфактура*. У 1866 цэнтр воласці, 499 ж., 78 двароў, нар. вучылішча, яўр. хедэры, царква і касцёл. У 1905—1080 ж. У 1920—22 у *Сярэдняй Літве*, у 1922—39 у складзе Польшчы, у Валожынскім пав. Навагрудскага ваяв. З 1939 у БССР, з 12.10.1940 цэнтр сельсавета *Юрацішкаўскага раёна*. У Вял. Айч. вайну ням. фашысты загубілі тут 75 мірных жыхароў, часткова спалілі вёску. З 1960 у Іўеўскім р-не. *М.Б.Батвіннік.*

ТРАВАСЕ́ЯННЕ, вырошчванне сеяных адна- і шматгадовых траў на корм і насенне на палях ці на прыродных кармавых угоддзях пры іх карэнным паляпшэнні. Асн. мэта Т. — атрыманне *зялёных кармоў, сена, сенажу, сіласу, травяной мукі*; павышэнне *ўрадлівасці глеб*, паляпшэнне *структуры глебы* (водапранікальнасці, водаўтрымальнай здольнасці, аэрацыі і інш.). Навук. абгрунтаванне перыяд. Т. даў В.Р.Вільямс. На Беларусі найб. гасп. значэнне мае Т. злакавых (цімафееўка лугавая, купкоўка зборная, аўсяніца лугавая і чырвоная, райграс пашавы і аднагадовы, лісахвост лугавы) і бабовых (віка яравая, пялюшка, сырадэля, канюшына чырвоная, белая і ружовая, рутвіца рагатая, люцэрна сіняя).

ТРАВАСУ́МЕСЬ, травастой з некалькіх відаў сеяных адна- ці шматгадовых траў. Простая Т. уключае 2—5, складаная — больш за 5 відаў траў. Вылучаюць Т. кароткатэрміновыя (выкарыстоўваюцца 3—4 гады), сярэдняй працягласці (5—7 гадоў) і шматгадовыя (10—15 гадоў). Выкарыстоўваюцца пад выпас жывёлы, на зялёны корм, для нарыхтоўкі *сена, сенажу, сіласу, травяной мукі*, у зялёным буд-ве. У параўнанні з пасевамі траў аднаго віду Т. больш ураджайныя, менш засмечваюцца пустаселлем і псуюцца шкоднікамі, паўней выкарыстоўваюць святло, вільгаць і пажыўныя рэчывы, забяспечваюць лепшую якасць кармоў, ахвотней паядаюцца жывёлай. Віды траў падбіраюцца з улікам іх біял. уласцівасцей і аграэкалагічных патрабаванняў. Для стварэння сенажатных угоддзяў выкарыстоўваюцца травы з аднолькавым вегетацыйным перыядам і тэрмінамі праходжання феналагічных фаз. У пашавыя Т. ўключаюць травы з рознымі тэрмінамі выспявання.

ТРАВЕРЦІ́Н (італьян. travertino), в а п н а в ы т у ф, лёгкая порыстая асадкавая карбанатная горная парода, нацёчныя намнажэнні *кальцыту*. Колер светлы, жаўтавата-шэры, буравата-шэры. Порыстасць 2—40%.

Часта мае адбіткі раслін, арган. рэшткі. Утвараецца ў выніку асаджэння карбанату кальцыю (кальцыту, араганіту) з гарачых або халодных вуглякіслых крыніц. У месцах выхаду крыніц складае тэрасы і ўзгоркі. Выкарыстоўваецца як флюсавы матэрыял, абліцовачны і дэкаратыўны камень, таксама для вытв-сці цэменту, вапны, карбіду кальцыю. Радовішчы ў Італіі, Арменіі, Азербайджане, Таджыкістане, Расіі, на Украіне і інш.

ТРАВЕСТА́ЦЫЯ (ад франц. travestir пераапранаць), сінкрэтычная форма нар. смеху, заснаваная на пераводзе ідэальнага, афіцыйна-высокага і сур'ёзнага ў нізкі, матэрыяльна-цялесны план; від *камічнага*. Асн. выяўленчы сродак Т. — амбівалентная гратэскавая вобразнасць (гл. *Амбівалентнасць*), першапачатковыя формы якой сфарміраваліся ў нар. культуры антычнасці, сярэдневякоўя і рэнесансу, развівалася ў мастацтве барока, *бурлеска*, асобных плынях рамантызму і мадэрнізму. У бел. культуры выявілася ў аўтэнтычных формах тэатралізаваных абрадаў, традыц. жанрах фальклору, дэкар.-прыкладным, тэатр. і цыркавым мастацтвах. Наглядныя формы Т. — маска і пераапрананне, імітацыя пярэвараценя (каза, мядзведзь, воўк і інш.), тэатралізацыя гратэскавых аксюмаранаў (кароль у вобразе жабрака, разумны дурань і інш.). Гэтыя і інш. формы Т. характэрны для тэатралізаваных абрадаў каляндарнага (калядныя, масленічныя, велікодныя, купальскія, русаллі) і сямейнага (хрысціны, вяселле) цыклаў, карагодаў, гульняў («Жаніцьба Цярэшкі», «Прарок», «Чорт», «Яшчур»), сюжэтна-ролевых жанраў нар. танцаў («Юрка», «Бычок», «Мікіта», «Журавель» і інш.). Гратэскавы свет Т. раскрывае адноснасць і тэатральнасць афіц. іерархіі, аўтарытэты і каштоўнасці пераносіць у камічны план. Гратэскавыя формы Т. шырока выкарыстоўвалі *скамарохі*. У 17—18 ст. Т. была асн. формай камічных інтэрмедый у школьным т-ры, якія кантраставалі з драм. сюжэтамі асн. часткі спектакля. Камізм дасягаўся каламбурамі і наўмысным скажэннем семантыкі латыні і польскай мовы «прастаком» з народа. Прыём пераносу «высокага» сты-

лю афіц. іерархіі ў смехавы аспект выкарыстоўваўся і ў т-ры *батлейка*. Эфект Т. ствараўся праз дасціпнае выкарыстанне традыц. для нар. смеху камізму здвоеных персанажаў, сэнсавым збліжэннем героя і яго дэманічна-камічнага дублёра-трыкатэра. Пазней прыёмы Т. развівалі паўпрафес. калектывы — выканаўцы нар. драмы «Цар Максімілян» і жывой батлейкі. У 20 ст. яны дапасаваны да сцэнаграфіі і тэатр. стыліставыкі мадэрнісцкага і постмадэрнісцкага т-ра. Вобразныя сродкі фалькл. Т. арыгінальна выявіліся ў бел. л-ры (гл. *Травесція*); яе рысы захаваліся ў асобных сатыр. жанрах л-ры, выяўл., цыркавога, эстраднага, тэатр., прыкладнога і інш. відаў сучаснага мастацтва.

Літ.: Бахтин М.М. Творчество Франсуа Рабле и народная культура средневековья и Ренессанса. М., 1990; Народны тэатр. Мн., 1983. *У.М.Конан.*

ТРАВЕСЦІ́Я, травесці, камічны жанр, заснаваны на зніжэнні высокіх хрэстаматыйных узораў класічнай паэзіі, міфалагічных або біблейскіх сюжэтаў. Узнікла ў новы час як рэакцыя на класіцызм з яго культам антычнасці і пагардай да нар. культуры. Характэрныя рысы Т.: агрубленне класічнага сюжэта, напаўненне яго быт. рэаліямі свайго часу, выкарыстанне самых нізкіх моўных пластоў, у т.л. дыялектаў.

Асабліва часта травесціравалася «Энеіда» Вергілія: у Францыі — П.Скарон (17 ст.), у Аўстрыі — А.Блумаўэр (18 ст.), у Расіі — М.Осіпаў (канец 18 ст.), на Украіне — І.Катлярэўскі (канец 18 — пач. 19 ст.); у Расіі мела таксама поспех травесційная паэма В.Майкава «Елісей, або Раздражнёны Вакх» (18 ст.).

У бел. л-ры прыёмам зніжэння карысталіся аўтары сатыр. твораў 17 — 1-й пал. 18 ст. («Прамова Мялешкі», «Казане руске» і інш.). Лінію травесційных «Энеід» працягвае паэма «*Энеіда навыварат*». Рысы Т. мае таксама паэма «*Тарас на Парнасе*».

Літ.: Лазарук М. Станаўленне беларускай паэмы. Мн., 1968; Кісялёў Г. Загадка беларускай «Энеіды». Мн., 1971. *Г.В.Кісялёў.*

ТРАВЯНА́Я МУКА́, вітамінна-бялковы корм з высушанай і размолатай травяністай масы. Захоўвае 90—95% пажыўных рэчываў сыравіны, мае 16—24% страўнага пратэіну, 35—45% безазоцістых экстрактыўных рэчываў, тлушчы, мінер. рэчывы, 200—300 мг/кг каратыну, вітаміны С, Е, К, групы В. У 1 кг Т.м. 0,7—0,9 кармавых адзінак. Прыгатаванне Т.м.: скошванне траў на ранніх фазах вегетацыі, здрабненне, высушванне, грануляванне. На Беларусі для Т.м. выкарыстоўваюць бабовыя (люцэрну, канюшыну, кармавы лубін, гарох, віку, сырадэлю), іх сумесі са злакавымі (цімафееўкай, аўсом, купкоўкай зборнай), таксама атаву траў і бацвінне караняплодаў. Дабаўляюць да рацыёну жывёл, уключаюць у склад камбікармоў.

ТРАВЯНІ́СТЫЯ РАСЛІ́НЫ, травы, жыццёвая форма раслін. Пашыраны ўсюды. Складаюць травастой лугоў, пашы і сенажацяў. На Беларусі каля 1,4 тыс. дзікарослых Т.р., больш за 5 тыс. відаў, сартоў і форм інтрадукавана.

Экамарфал. адзнака Т.р. сезоннага клімату — адсутнасць прамастойных надземных сцёблаў, што перажываюць неспрыяльны сезон. Сцёблы бываюць мяккія, сакаўныя або маюць некат. характэрныя рысы ўнутр. будовы (слабае адраўненне, рассечаная ці моцна парэнхіматызаваная стэла, адсутнасць *перыдэрмы*, слабая дзейнасць *камбію*). Т.р. бываюць аднагадовыя і шматгадовыя, пупышкі ўзнаўлення якіх знаходзяцца на ўзроўні глебы або ў глебе і размешчаны на карэнішчах, каўдэксах, клубнях, цыбулінах, радзей на паўзучых падземных парастках.

ТРАГЕ́ДЫЯ (грэч. tragōdia ад tragos казёл + ōdē песня), від драмы, засн. на глыбокіх, трагічных калізіях (гл. *Трагічнае*), супярэчнасцях, якія развіваюцца ў вострыя, непрымірымы канфлікт, што вядзе да гібелі станоўчых герояў ці абодвух процідзейных бакоў, да сутыкнення моцных характараў, логікай падзей асуджаных на пакуты, значныя страты, на безвыходнасць. Сцвярджальны пафас Т. найчасцей увасоблены ў вобразе незвычайнай асобы, носьбіта высокіх ідэалаў. Асн. праблематыка — злачынства і пакаранне, адзінота чалавека сярод людзей, маральная адказнасць, сэнс жыцця, подзвіг у імя высокай ідэі і інш.; цэнтр. героі — асобы выключныя, высакародныя (у стараж. грэкаў — багі і цары).

Т. зарадзілася ў Стараж. Грэцыі з культу Дыяніса; напачатку была далёкая ад пазнейшых жанрава-атрыбутыўных форм. Вылучэнню ўласна Т. з культава-рэліг. відовішчаў садзейнічала ўзвелічэнне ролі карыфея хору сатыраў, што прывяло да строгага чаргавання песенных частак з дэкламацыйным апавяданнем пра пакуты і прыгоды героя. Росквіту дасягнула ў 5 ст. да н.э. (Эсхіл, Сафокл, Эўрыпід). Катарсіс, ачышчэнне праз пакуты і спагаду — мэта ант. Т. Сінкрэтызм грэч. Т. — прычына яе замірання ў пазнейшую эпоху. На новым маст.-выяўл. узроўні адрадзілася ў эпоху Рэнесансу і барока. У трагедыях К.Марла, Лопэ дэ Вэгі, П.Кальдэрона, У.Шэкспіра дзейнічаюць шматгранныя характары. У перыяд класіцызму найлепшыя Т. стварылі П.Карнель, Ж.Расін, у рус. л-ры — А.Сумарокаў, Я.Княжнін, У.Азераў. У межах патрабаванняў класіцызму (адзінства часу, месца дзеяння) Т. стварыў Ф.Шылер. Пачынаючы з трагічных драм рамантыкаў (Дж.Байран, В.Гюго, М.Лермантаў і інш.), складваюцца жанры, што адрозніваюцца ад класічнай Т. прынцыпамі рэаліст. абагульнення (мяшчанская Т., рамантычная Т., меладрама, гіст. драма, нар. драма). Далейшая трансфармацыя Т. адбылася ў рэаліст. л-ры. Усё часцей трагедыйная танальнасць спалучаецца з камедыйнай (гл. *Трагікамедыя*). Значны ўклад у развіццё жанру зрабіла рус. л-ра («Барыс Гадуноў», «Скупы рыцар», «Моцарт і Сальеры» А.Пушкіна, «Навальніца» А.Астроўскага, «Смерць Іаана Грознага» А.К.Талстога і інш.).

Першыя спробы стварэння бел. Т. адносяцца да 18 ст. («Суддзя без розуму» К.Марашэўскага, «Сапар» і «Фемістокл» М.Цяцерскага, «Крэз» І.Юрэвіча; усе на польскай мове). У пач. 20 ст. на аснове трагедыйных калізій напісаны п'есы «Антось Лата» Я.Коласа, «Пакрыўджаныя» Л.Родзевіча, «Бязродны» У.Галубка, «Чырвоныя кветкі Беларусі» В.Гарбацэвіча і інш. У бел. сав. л-ры з яе арыентацыяй на аптымістычнасць пафасу жанр Т. развіваўся менш інтэнсіўна, чым іншыя, нешматлікія трагедыйныя творы тэматычна далучыліся да гераічнай тэматыкі («Людзі і д'яблы» К.Крапівы, «Першы ўрок» К.Губарэвіча, «Юныя мсціўцы» В.Хазанскага і А.Гутковіча, «Шпачок» А.Махнача, «Рашэнне» В.Быкава, «Злавеснае рэха» А.Петрашкевіча і інш.) або гіст. («Кастусь Каліноўскі» Е.Міровіча, «Званы Віцебска» У.Караткевіча, «Купала» А.Дударава і інш.).

Літ.: Семяновіч А. Беларуская драматургія (дакастрычніцкі перыяд). Мн., 1961; Сабалеўскі А. Беларуская савецкая драма. Кн. 1—2. Мн., 1969—72. *С.С.Лаўшук.*

ТРАГІКАМЕ́ДЫЯ, драматычны твор, у якім спалучаюцца характэрныя рысы *трагедыі* і *камедыі*. У аснове — своеасаблівае трагікамічнае светаадчуванне, якое звязана з пачуццём адноснасці крытэрыяў жыцця і ўключае разнастайныя, часам процілеглыя тэндэнцыі. Жанравыя межы не акрэслены, абавязковым з'яўляецца пачуццё адноснасці крытэрыяў ацэнкі аўтарам і персанажамі жыццёвых рэалій. Трагікамічнасць светаадчування ўласціва нар. творчасці, у прафес. л-ры на розных этапах гіст. развіцця яна праяўлялася спарадычна.

У антычнасці пад тэрмінам Т. разумелася ўсякае парушэнне жанравай чысціні трагедыі ці камедыі. Як жанр у еўрап. л-рах з'явілася на мяжы 16—17 ст., калі сфарміраваліся яе асн. жанравыя ўласцівасці: спалучэнне ў межах аднаго твора смешных (за выключэннем фарсавых) і сур'ёзных (у т.л. патэтычных) момантаў пры шчаслівай развязцы канфлікту; перапляценне «ўзвышаных» рэліг. сюжэтаў з быт. камізмам іх асэнсавання; двайны зыход сітуацый (пакаранне зла — узнагарода дабрачыннасці); змешванне ўзвышаных і камічных характараў і інш. У 2-й пал. 17 ст. эстэтыка класіцызму размежавала трагедыю і камедыю. У далейшым Т. амаль знікла. Адрадзілася ў канцы 19 ст. («Геда Габлер» і «Дзікая качка» Г.Ібсена, «Крэдыторы» і «Саната прывідаў» А.Стрындберга, «Тры сястры» А.Чэхава і інш.). У 20 ст. Т. пачала распрацоўваць праблематыку трагедыі. Яшчэ больш замацавалася практыка збліжэння трагічнага і камічнага (творы Ф.Дзюрэнмата, Э.Іанеска, Т.Уільямса і інш.).

На Беларусі Т. вядома з сярэдзіны 18 ст. («Уваскрэсенне мёртвых...» Г.Каніскага і інш.) у форме, прамежкавай паміж трагедыяй і камедыяй. Больш глыбока трагікамічныя калізіі выявіліся ў творах пач. 20 ст. («Васількі» А.Паўловіча, «Жартаўлівы Пісарэвіч» М.Гарэцкага, «Тутэйшыя» Я.Купалы і інш.). Вял. ўклад у распрацоўку жанру Т. ў бел. драматургіі зрабіў А.Макаёнак. У яго творах трагікамічнае дапаўняецца, як правіла, сатырычна-гратэскавым («Зацюканы апостал», «Пагарэльцы», «Дыхайце эканомна»).

Літ.: Борев Ю. Комическое... М., 1970; Дземидок Б. О комическом...: Пер. с пол. М., 1974. *С.С.Лаўшук.*

ТРАГІ́ЧНАЕ, эстэтычная катэгорыя, якая адлюстроўвае невырашальны пры

наяўным узроўні гармадскага быцця і свядомасці канфлікт, што ўзнікае і разгортваецца ў выніку свабодных учынкаў асобы, гераічнага сутыкнення процілегла накіраваных, неаднолькава матываваных грамадскіх сіл. Суправаджаецца пакутамі, нярэдка завяршаецца смерцю герояў, змагароў за сцвярджэнне грамадскага ці асабістага *ідэалу*. Суадносіцца з катэгорыямі *ўзнёслага* і *прыгожага*, процілеглае *камічнаму*. Аб'ектыўная аснова Т. — адноснасць, пераходнасць і смяротнасць усяго існага ў яго канкрэтна-пачуццёвай форме, недасканаласць чалавека, грамадства, дзярж. ладу. Магчымасць Т. ёсць ва ўсіх формах быцця, але для паўнаты яго выяўлення неабходна наяўнасць суб'ектыўна-аб'ектыўных суадносін, што магчыма толькі ў свядомай жыццядзейнасці чалавека і грамадства. У эстэтыцы вылучаюць а б ' е к т ы ў н а - т р а г і ч н а е (трагічная сітуацыя і яе вырашэнне праз *канфлікт* у грамадскім быцці) і с у б ' е к т ы ў н а - т р а г і ч н а е (трагічная сітуацыя, адлюстраваная ў эстэт. пачуццях, ацэнках, мастацтве). У рэальным быцці адрозніваюць трагедыю новага, якое актыўна змагаецца са старымі сістэмамі і каштоўнасцямі, але яшчэ не здольнае да пазітыўнай рэалізацыі, і трагедыю гібелі старых сістэм і каштоўнасцей, якія не паспелі выявіць свае творчыя магчымасці. Магчымасці выяўлення Т. неаднолькавыя ў розных відах і жанрах мастацтва: толькі адносныя ў архітэктуры і інш. прыкладных мастацтвах сродкамі сімвалічнай пластыкі і дэкору; большыя ў выяўл. мастацтве; неабмежаваныя ў тэатры, музыцы, л-ры, асабліва ў жанрах *трагедыі*.

Праблему Т. ўпершыню распрацаваў Арыстоцель (структура трагедыі, тэорыя *катарсісу*). Сімвал Т. ў хрысц. мастацтве — вобразы ўкрыжаванага Хрыста і святых пакутнікаў.

Паводле гуманіст. традыцыі, у кантэксце якой развівалася бел. культура эпохі Адраджэння, разуменне трагічнасці жыцця ўваходзіць у паняцце мудрасці (эстэтыка Ф.Скарыны, Сімяона Полацкага, інш. асветнікаў). Бел. класічная л-ра адлюстравала асн. аспекты Т. ў быцці народа: хуткаплыннасць зямнога жыцця; трагедыя народа, які абудзіўся для нац. і сац. вызвалення, але не ў сілах рэалізаваць свае ідэалы; трагічны лёс духоўна актыўнай асобы (вобраз песняра, прарока, гусляра, рыцара), што ахвяруе сваім жыццём дзеля вызвалення народа, які яшчэ не да канца ўсвядоміў сябе свабоднай нацыяй. У эстэтыцы сацыяліст. рэалізму паняццю Т. быў нададзены класава-пралетарскі, пазней сацыяліст. змест: сфера Т. тэматычна звужалася да трагічнага лёсу дзеячаў рэвалюцыі, герояў грамадзянскай і Вял. Айч. войнаў.

Літ.: А р и с т о т е л ь. Поэтика // Соч.: Пер. с древ.-греч. М., 1983. Т. 4; Б о р е в Ю.Б. О трагическом. М., 1961; К р ю к о в с к и й Н.И. Основные эстетические категории: Опыт систематизации. Мн., 1974.

У.М.Конан.

ТРАГЛАБІЁНТЫ (ад грэч. trōglē пячора, нара + *біёнт*), жывёлы, што пастаянна жывуць у *пячорах*, пячорных вадаёмах і падземных водах; прадстаўнікі *спелеафауны*. Характарызуюцца запаволеным абменам рэчываў, расцягнутым жыццёвым цыклам, дэпігментацыяй, адсутнасцю зроку, лепш развітымі органамі дотыку, нюху, бакавой лініі; для жывёл, якія жывуць у буйных падземных поласцях, уласціва павелічэнне памераў прыдаткаў і цела. Сярод Т. найб. звычайныя ракападобныя, малюскі, п'яўкі, калаўроткі, паліхеты, рыбы, амфібіі. Большасць Т. — эндэмікі і рэлікты стараж. фаун.

ТРАГЛАДЫ́Т (ад грэч. trōglodytēs, які жыве ў нары або пячоры), першабытны пячорны чалавек. У пераносным сэнсе — некультурны чалавек, невук.

ТРАДЗЯКО́ЎСКІ Васіль Кірылавіч (5.3.1703, г. Астрахань, Расія — 17.8.1768), рускі пісьменнік, філолаг. Вучыўся ў Славяна-грэка-лац. акадэміі (Масква, 1723—26), Сарбоне (1727—30). У 1732—59 перакладчык у Пецярбургскай АН (з 1745 акад.). Пераклаў раманы П.Тальмана «Паездка ў востраў Кахання» (1730; дадаў да яго свае любоўныя вершы, напісаныя мовай, блізкай да размоўнай), Д.Барклея «Аргеніда» (1751), рус. гекзаметрам раман Ф.Фенелона «Прыгоды Тэлемака» («Тылемахіда», 1766). У трактаце «Новы і кароткі спосаб да складання расійскіх вершаў» (1735) прапанаваў новы прынцып арганізацыі рус. верша — сілаба-танічнае вершаскладанне, у зб. «Творы і пераклады як вершамі так і прозай» (т. 1—2, 1752) выклаў сваю тэорыю перакладу. Аўтар філас. паэмы «Феоптыя» (нап. 1753, выд. 1963), даследавання «Аб старажытным, сяроднім і новым вершаскладанні расійскім» (1755). Яго праца «Размова пра артаграфію» (1748) — першая рас. спроба вывучэння фанет. ладу мовы. Пераклаў «Старажытную гісторыю» Ш.Ралена (т. 1—10, 1749—62), «Рымскую гісторыю» (т. 1—16, 1761—67) і інш. Пісаў драмы, оды, байкі, эпіграмы. На бел. мову яго байку «Фанабэрысты сабака» пераклаў Э.Валасевіч.

Тв.: Избр. произв. М.; Л., 1963.

Літ.: Венок Тредиаковскому. Волгоград, 1976; Д е р ю г и н А.А. В.К. Тредиаковский — переводчик: Становление классицистского перевода в России. Саратов, 1985.

Л.В.Календа.

ТРАДЫ́ЦЫЯ І НАВА́ТАРСТВА, супрацьлеглыя і адначасова ўзаемадапаўняльныя тэндэнцыі ў развіцці маст. творчасці і культуры наогул. Т р а д ы ц ы я (ад лац. traditio перадача, паданне) у шырокім сэнсе — культ. спадчына народаў, сусв. і рэгіянальных цывілізацый, якія актуалізуюцца ў кантэксце сучаснасці, служаць асновай для развіцця нац. культуры і надаюць ёй цэласнасць і самабытнасць. У культуралогіі традыцыя — сукупнасць архетыпаў аўтэнтычнай нац. культуры, выяўленых у міфалогіі, рэлігіі, абрадах, фальклоры і інш., якія выступаюць у якасці ўзораў, норм паводзін і маральных імператываў. Н а в а т а р с т в а (ад лац. novator абнавіцель, вынаходнік) характарызуе адкрытасць культуры для канструктыўных навацый і міжнац. культ. ўзаемадзеяння, змену яе парадыгмаў і сэнсавых значэнняў. Пераемнасць у развіцці культуры адбываецца праз дыялектычна супярэчлівае адзінства і ўзаемапераходы Т. і н. Канструктыўныя навацыі актуалізуюць традыцыю, уключаюць яе ў дынаміку сучаснага творча-культ. працэсу і паступова самі набываюць статус традыцыі. Суадносіны паміж Т. і н. — велічыня пераменная, неаднолькавая на розных этапах развіцця грамадства. Першую універсальную традыцыю маст. культуры стварыла ант. цывілізацыя. Сярэдневяковая культура, арыентаваная на сакральныя каштоўнасці, выступала ў якасці антытэзы да ант. традыцыі, але разам з тым дапасавала да хрысц. ідэалогіі развітыя формы ант. філасофіі, навукі, выяўл. мастацтва. Гэты «селекцыйны» працэс адмаўлення ўстарэлых форм традыцыі і трансфармацыі яе лепшых дасягненняў працягваўся ў эпоху Адраджэння, новага часу, рэалізаваўся ў культ. творчасці 20 — пач. 21 ст.

Архетыпы бел. культ. традыцыі сфарміраваліся на стыку шматвяковай нар. культуры і хрысц. цывілізацыі. Эпоха гуманіст. Адраджэння здолела сінтэзаваць ант. рэалізм і эстэтызм з напружанай хрысц. духоўнасцю (Ф.Скарына, М.Гусоўскі, М.Сматрыцкі, гатычны і рэнесансавы стылі ў архітэктуры і выяўл. мастацтве). Барока як стыль эпохі выступіла ў якасці антытэзы да эпігонскай стылізацыі ў мастацтве і адначасова дапасавала да новага культ. кантэксту папярэднія адкрыцці ў галінах эстэтыкі, красамоўства, тэатр. і выяўл. мастацтва, стварыла бел. варыянт еўрап. мураванай архітэктуры, самабытны стыль драўлянага дойлідства 17—18 ст. Нарматыўная эстэтыка класіцызму вярнулася да ант. і рэнесансавых традыцый; сінтэз класічных і барочных традыцый выявіўся ў л-ры (М.К.Сарбеўскі, Сімяон Полацкі), выяўл. і тэатр. мастацтве. Станаўленне новай бел. л-ры ў 19 ст., развіццё інш. відаў прафес. мастацтва на Беларусі ў 20 ст. адбываліся на аснове нац. традыцый і наватарскіх адкрыццяў польскай, рус. і агульнаеўрап. маст. культуры.

Літ.: Б у ш м и н А.С. Преемственность в развитии литературы. 2 изд. Л., 1978; Л а д ы г и н а А.Б., Г р и н и н В.В. О преемственности в искусстве. М., 1982; С т е п а н ц е в и ч К.И. Новые тенденции в развитии белорусского музыкального искусства: (Конец 1950-х — первая половина 1970-х гг.). Мн., 1981; На грани тысячелетий: Судьба традиций в искусстве XX в.: [Сб. ст.]. М., 1994.

У.М.Конан.

ТРАДЭСКА́НЦЫЯ (Tradescantia), род кветкавых раслін сям. камялінавых. Больш за 60 відаў. Пашыраны ў тропіках і субтропіках Амерыкі. На Беларусі вырошчваюць у аранжарэях і пакоях

Т. белакветную (T. albiflora), Блосфельда (T. blossfeldiana), прырэчную (T. fluminensis), стракатую (T. multicolor) і інш.

Шматгадовыя травяністыя расліны. Сцёблы прамастойныя або сцелістыя. Лісце суцэльнае, гладкае ці апушанае, чаргаванае, ланцэта- або яйцападобнае, зялёнае, ліловачырв., часам стракатае. Кветкі дробныя, белыя, блакітныя, ліловыя, ружовыя, адзіночныя ці ў пазушных або верхавінкавых суквеццях. Плод — каробачка. Дэкар. (ампельныя) расліны.



Традэсканцыя віргінская.

ТРАЕКТО́РЫЯ (ад позналац. trajectorius які належыць да перамяшчэння), неперарыўная лінія, якую апісвае матэрыяльны пункт пры сваім руху. Т. нябесных цел наз. *арбітамі*. Калі Т. — прамая лінія, рух пункта наз. прамалінейным, у адваротным выпадку — крывалінейным. Выгляд Т. залежыць ад сіл, што дзейнічаюць на пункт, характару *сувязей механічных*, пачатковых умоў руху пункта, *сістэмы адліку* і інш. Напр., Т. пункта, які рухаецца ў цэнтр. полі прыцягнення, залежыць ад яго пачатковай скорасці і можа быць прамой лініяй, эліпсам, гіпербалай, акружнасцю ці парабалай. Вызначэнне Т. для розных цел мае важнае значэнне пры навук. даследаваннях і вырашэнні многіх практычных задач (напр., разлік арбіт штучных касм. аб'ектаў). Знаходжанне Т. руху часціц і цел — адна з задач *кінематыкі*.



Віды **траекторыі** цела з пачатковай гарызантальнай скорасцю v_0 у полі прыцягнення Зямлі: 1 — акружнасць ($v_0 = \sqrt{gR}$); 2 — эліпс ($v_0 > \sqrt{gR}$); 3 — парабала ($v_0 = \sqrt{2gR}$); 4 — гіпербала ($v_0 > \sqrt{2gR}$); R — радыус Зямлі; g — паскарэнне свабоднага падзення.

ТРАЕ́ЦКІЯ ПЕ́СНІ, сёмушныя песні, песні веснавога цыкла каляндарна-абрадавай паэзіі, што спяваліся на *Сёмуху* (Тройцу), для якой характэрны культ расліннасці. Вядомы слав. народам, у т.л. беларусам. Вылучаюцца песні, цесна звязаныя з абрадавымі дзеяннямі і т.зв. прымеркаваныя (сувязі якіх з абрадамі цяжка вызначыць). Сярод абрадавых вылучаюцца некалькі груп песень: з матывамі ўслаўлення зеляніны (часцей бярозы); пры завіванні вянкоў; кумлення; любоўнай тэматыкі (пра каханне, выбар пары, замужжа, любоўную варажбу). У многіх Т.п. вобразы раслін, дрэў персаніфікаваныя. Асабліва распаўсюджаны ў абрадах і песнях персаніфікаваны вобраз бярозы. Яна была важным абрадавым атрыбутам (да яе ішлі ў лес, галінкі неслі ў хату), у песнях яна адыгрывала ролю распараджальніцы свята, пад бярозай праходзіў абрад кумлення, з яе галінак плялі вянкі «на годы добрыя, на жыта густое, на ячмень каласісты», па вянках дзяўчаты варажылі пра свой лёс і г.д. Паступова траецкія святы ператварыліся ў маляўнічую гульню моладзі, а самі песні страцілі строгую прымеркаванасць да абраду. У наш час бытуюць у асн. на Палессі. Лакальная разнавіднасць Т.п. — *куставыя песні*.

Публ.: Веснавыя песні. Мн., 1979.

Літ.: Соколова В.К. Весенне-летние календарные обряды русских, украинцев и белорусов, XIX — начало XX в. М., 1979; Барташэвіч Г.А. Беларуская народная паэзія веснавога цыкла і славянская фальклорная традыцыя. Мн., 1985. *Г.А.Барташэвіч.*

ТРАІ́СТАЯ ЗГО́ДА, гл. *Антанта*.

ТРАІ́СТАЯ МУ́ЗЫКА, традыцыйны нар. ансамбль з разнастайным складам муз. інструментаў, у аснове якога прынцып спалучэння трох муз. функцый: меладычнай (мелодыя), структурна-гарманічнай, ударна-метрычнай. Бел. нар. назвы «капэла», «настаяшчая музыка» (Паазер'е), «кампанія», «вясёлыя». Гістарычна ў складзе ансамбляў 2 скрыпкі, басэтля; скрыпка, гармонік, бубен або 2 скрыпкі, цымбалы, бубен; а таксама разнастайныя варыянты з іх. У пач. 20 ст. склад ансамбля дапоўніўся гармонікам, кларнетам, трубой, пазней баянам і акардэонам, якія неслі лакальныя традыцыі пэўнага рэгіёна. У рэпертуары звычайна нар. песні, танцы, маршы (на вяселлях, вечарынках і інш. урачыстасцях) і інш. Пашыраны таксама на Украіне, у Польшчы.

Літ.: Скорабагатчанка А.В. Народная інструментальная культура Беларускага Паазер'я. Мн., 1997; Яе ж. Інструментазнаўства. Мазыр, 2000. *А.В.Скорабагатчанка.*

ТРАІ́СТЫ САЮ́З 1882 (ням. Dreibund), ваенна-паліт. блок Германіі, Аўстра-Венгрыі і Італіі, які існаваў да 1-й сусв. вайны. Склаўся на аснове *аўстра-германскага дагавора 1879*. Афармлены сакрэтным пагадненнем аб абароне (падпісаны 20.5.1882 у Вене на 5 гадоў) паміж Аўстра-Венгрыяй, Герм. імперыяй і Італіяй. Прадугледжваў узаемную ваен. падтрымку бакоў у выпадку магчымага нападу на адзін з іх Францыі ці Расіі, абавязацельствы не ўдзельнічаць у саюзах, скіраваных супраць аднаго з удзельнікаў дагавора, і інш. Быў важным элементам у сістэме знешнепаліт. саюзаў О. фон *Бісмарка*. У 1887 і 1891 дагавор прадоўжаны і дапоўнены палажэннямі на карысць Італіі. У процівагу яму ў 1904—07 утварылася *Антанта*. Т.с. часткова страціў значэнне пасля заключэння ў 1902 італа-франц. дагавора аб нейтралітэце, канчаткова ён распаўся на пач. 1-й сусв. вайны, калі Італія абвясціла свой нейтралітэт (1914), а потым уступіла ў вайну на баку Антанты (1915).

ТРАЙБАЛІ́ЗМ, трыбалізм (англ. tribalism ад tribe племя), вызначэнне з'явы ў паліт. жыцці многіх афр. краін, дзе ў грамадстве захаваліся моцныя родаплемянныя сувязі. Выяўляецца ў спрыянні супляменнікам у занятці пасад у дзярж. апараце і спалучэнні паліт. і міжплемянной барацьбы. З'яўляецца гал. прычынай паліт. нестабільнасці і грамадз. войнаў у краінах Афрыкі.

ТРАЙДЗЕ́НЬ, Трайдзен (?—1282?), вялікі князь ВКЛ [каля 1270—82]. Уладу атрымаў пасля смерці галіцка-валынскага кн. *Шварна*, які дзякуючы шлюбу з дачкой *Міндоўга* некалькі гадоў быў вял. князем ВКЛ. Прыход да ўлады Т. стаў прычынай разрыву сувязі Літвы з Галіцка-Валынскім княствам і, верагодна, суправаджаўся рэпрэсіямі супраць хрысціянства. Тым не менш пад уладай Т., апрача этнічна літоўскіх зямель, засталіся землі і гарады Бел. Панямоння. Гал. рэзідэнцыяй Т. стаў замак Кернава. Пры ім да ВКЛ канчаткова далучаны прылеглыя землі яцвягаў, земгалаў і селаў, аднавіліся далёкія набегі на эстонскія ўладанні крыжакоў (в-аў Саарэмаа і інш.) і на Польшчу. Каля 1274 Т. спрабаваў захапіць ў галіцка-валынскага кн. Льва Данілавіча падляшскі г. Драгічын. Т. супрацьдзейнічаў спробам экспансіі галіцка-валынскіх князёў у Панямонне і ваенным паходам татар на Літву (каля 1275 і ў 1277). Даваў прытулак уцекачам з Прусіі, дзе ў 1276 было задушана антыкрыжацкае паўстанне, рассяляў іх у ваколіцах Гародна і Слоніма. У 1279 нанёс паражэнне войскам Лівонскага ордэна пад Ашэрадам у Курляндыі. У 1281 Т. дамогся пераходу

пад кантроль ВКЛ новапабудаванага замка крыжакоў у Дынабургу (Даўгаўпілс). Дзякуючы шлюбу дачкі Т. Гаўдэмунды з князем Мазовіі Баляславам Плоцкім значна пашырыўся знешнепаліт. ўплыў ВКЛ. *В.Л.Насевіч.*

ТРА́ЙКАЎСКІ Борыс (н. 25.6.1956, г. Струміца, Македонія), македонскі паліт. і дзярж. дзеяч. Юрыст. Скончыў ун-т у г. Скоп'е. Працаваў юрысконсультам. З 1992 саветнік па знешнепаліт. справах лідэра руху за незалежнасць Македоніі Л.Георгіеўскага, кіраўнік камісіі па знешняй палітыцы Усемакед. рэв. арг-цыі — Дэмакр. партыі макед. нац. адзінства (да 1998), адказны за размеркаванне міжнар. гуманіт. дапамогі сярод албанскіх бежанцаў з Косава, саветнік мэра г. Скоп'е (з 1997), нам. міністра замежных спраў Македоніі. Са снеж. 1999 прэзідэнт Македоніі. Праводзіць курс на інтэграцыю краіны ў Еўрап. Саюз і НАТО. *М.С.Даўгяла.*

ТРАЙНА́Я РЫ́ФМА, рыфма, якая спалучае тры суседнія вершаваныя радкі. Звычайна ўжываецца ў трохрадкоўях, зрэдку ў *астрафічным вершы*:

Я сасню цябе, я **сасню**
Арыкаў сінюю **глыбіню**,
Бавоўны белую **гарачыню**,
Прахалоду блакітных **гор**,
Рэха дальняе **наўздагон**,
Радзіму бацькі **майго**...

(В.Іпатава. «Кіргізія»)

В.П.Рагойша.

ТРА́ЙНЫ ПУ́НКТ у аднакампанентнай сістэме, пункт на *дыяграме стану* рэчыва, што адпавядае т-ры і ціску, пры якіх у раўнавазе знаходзяцца 3 фазы (звычайна крышт., вадкая і газападобная).

У Т.п. сыходзяцца лініі двухфазных раўнавага: лінія выпарэння (раўнавага вадкасць — пара), лінія сублімацыі (раўнавага крышталь — пара), лінія плаўлення (раўнавага крышталь — вадкасць) і раздзеленыя гэтымі лініямі фазавыя палі, што адпавядаюць крышталям, вадкасці і пары. Т.п. нанварыянтны, г.зн., што не дапускаецца змяненне ніводнага з параметраў стану. Пры наяўнасці *полімарфізму* на дыяграме стану з'яўляюцца дадатковыя Т.п., што адпавядаюць раўнавазе 2 цвёрдых фаз з парай або вадкасцю (напр., у серы). Выкарыстоўваюць Т.п. ў тэрмаметрыі для градуіроўкі прыбораў; Т.п. вады (т-ра 273,16 К, ціск 611 Па) — асн. рэперны пункт абс. тэрмадынамічнай тэмпературнай шкалы.

ТРА́ЙЧКЕ, Трэйчке (Treitschke) Генрых фон (15.9.1834, г. Дрэздэн, Германія — 28.4.1896), нямецкі гісторык і публіцыст; прадстаўнік малагерманскай (пруска-германскай) гістарыяграфічнай школы. Чл. Германскай АН у Берліне (1895). Выкладаў у Фрайбургскім (з 1863), Кільскім (з 1866), Гайдэльбергскім (з 1867), Берлінскім (з 1874) ун-тах. У 1866—89 рэдактар час. «Preussische Jahrbücher» («Прускія штогоднікі»). У 1871—84 дэп. рэйхстага Герм. імперыі. З 1886 (пасля смерці Л. фон *Ранке*) афіц. гістарыёграф прускай дзяржавы. У сваёй паліт. і навук.-публіцыстычнай дзейнасці зыходзіў з антысеміцкіх, антысацыяліст., англафобскіх пазіцый. Яго ідэал — моцная манархічная дзяржава, здольная змагацца за сусв. гегемонію (на думку Т., гэта манархія *Гогенцолернаў*). Аўтар прац «Нямецкая гісторыя ў XIX ст.» (т. 1—5, 1879—94), «Палітыка» (т. 1—2, 1897—98) і інш.

ТРАКА́Й (Trakai), Трокі, горад на Пд Літвы, паміж Тракайскімі азёрамі. 6,1 тыс. ж. (2001). Вузел аўтадарог, чыг. станцыя. Прам-сць харч. і мясцовая. Турыстычны цэнтр. Ландшафтны заказнік.

Засн. ў канцы 12 ст. У 14—15 ст. значны паліт. цэнтр ВКЛ, рэзідэнцыя вял. князёў — з 1320 *Гедзіміна*, з 1341 *Кейстута*, потым *Вітаўта*, які перасяліў сюды караімаў (жывуць у Т. і цяпер). У 1409 атрымаў гар. права. У 1413—1795 адм. цэнтр *Троекскага ваяводства* ВКЛ. З 1795 у Рас. імперыі, адм. цэнтр Троекскага пав. Віленскай губ. (1795—97, 1801—1920). У 1920—22 у *Сярэдняй Літве*, з 1922 у складзе Польшчы, з кастр. 1939 у Літ. Рэспубліцы. З часоў сярэдневякоўя некат. ч. насельніцтва горада складаюць беларусы.

Старая ч. горада (сфарміравалася да 15 ст.) з'яўляецца помнікам горадабудаўніцтва. Захаваліся рэшткі замка 13 ст. на паўвостраве, *Тракайскі замак*, касцёл Вітаўта (1409, перабудаваны ў 18 ст. ў стылі барока), руіны кляштара бернардзінцаў (17—18 ст.), кінеса (храм караімаў; 1-я пал. 19 ст.), палац Тышкевічаў (1896, арх. І.Хус) і інш.

Літ.: Верцинкявичюс Ю.Ю. Тракай: [Альбом]. Вильнюс, 1981.



Тракайскі замак.



Тракененская парода коней.

ТРАКА́ЙСКІ ЗА́МАК, помнік абарончага дойлідства 2-й пал. 14 — пач. 15 ст. ў г. Тракай (Літва). Размяшчаецца на в-ве воз. Гальве. У 15 ст. адна з рэзідэнцый вялікіх князёў ВКЛ, месца ўрачыстасцей і прыёмаў дыпламатаў. У замку ў 1415 і 1416 кн. Вітаўт вёў перагаворы з магістрамі Лівонскага ордэна, у 1483 кароль Казімір IV Ягелончык — з вял. магістрам Тэўтонскага ордэна. Замак часта перабудоўваўся і прыстасоўваўся да патрэб сваіх гаспадароў. У вайну 1655—60 зруйнаваны і з часам прыйшоў у заняпад. Адбудаваны ў 1953—61 паводле праекта арх. Б.Крумініса, прызамкавая ч. адбудоўвалася з 1961 (праект арх. С.Мікулёніса). Палац (узведзены ў 1342) канвентнага тыпу, складаецца з 2 паралельна пастаўленых 3-ярусных, прамавугольных у плане карпусоў (маюць контрфорсы, галерэю на 2-м ярусе, высокія 4-схільныя дахі) і 3-яруснага данжона. Будынкі (з чырвонай цэглы) размешчаны вакол невял. ўнутр. двара. Для аздаблення інтэр'еру выкарыстаны прафіляваная цэгла, дэкар. кафля, вітражы і інш. Пад падлогай абсталявана спец. ацяпленне. Палац быў абкружаны абарончай сцяной з 3-ярусным вежамі. Цяпер у Т.з. гіст. музей.

Літ.: Микуленис С.А. Тракайский замок. Вильнюс, 1978.

ТРАКЕ́ЛІ, вёска ў Бастунскім с/с Воранаўскага р-на Гродзенскай вобл., на скрыжаванні аўтадарог Ліда—Геранёны і Радунь—Іўе. Цэнтр калгаса. За 15 км на ПдУ ад г.п. Воранава, 131 км ад Гродна, 9 км ад чыг. ст. Бастуны. 571 ж., 201 двор (2002). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў. Помнік архітэктуры — касцёл Дабравешчання Найсвяцейшай Дзевы Марыі (1809).

ТРАКЕ́НЕНСКАЯ ПАРО́ДА, парода верхавых коней. Выведзена ў 18 ст. ва Усх. Прусіі (Тракененскі конны завод; цяпер Калінінградская вобл., Расія) скрыжаваннем англ. чыстакроўнай, арабскай і інш. верхавых парод і іх памесей з літоўскімі мясц. конямі. Разводзяць у Расіі, Літве, Беларусі, краінах Еўропы, Амерыкі, Азіі для паляпшэння мясц. верхавых парод і коннага спорту.

Канстытуцыя моцная, сухая. Тулава масіўнае, доўгае. Касцяк і мускулатура добра развітыя. Выш. ў карку 162—166 см. Маса жарабцоў 595, кабыл 560 кг. Масць пераважна рудая, гнядая, вараная.

ТРАКЛЬ (Trakl) Георг (3.2.1887, г. Зальцбург, Аўстрыя — 3.11.1914), аўстрыйскі паэт; найбуйнейшы прадстаўнік *экспрэсіянізму*. Як паэт фарміраваўся пад уплывам класічнай традыцыі і паэзіі 2-й пал. 19 ст. Аўтар паэт. зб-каў «Вершы» (1913), «Себасцьян у сне» (1915), аднаактовых п'ес «Скокі смерці» і «Фата Маргана» (паст. ў 1916, лічацца згубленымі), у якіх адчуванні крызіснасці і непазбежнасці скону. Т. спалу-

чаў рэаліі сучаснасці з умоўнасцю, жывапіснасць з музычнасцю, раскрываў патаемны сэнс будзённа-звыклага. У яго паэтыцы пераважае верлібр са свабоднымі сінтакс. канструкцыямі, выкарыстанне гратэску, складаная метафорыкі, шматзначнай сімволікі, міфалагічных матываў і вобразаў. На бел. мову асобныя яго вершы пераклаў В.Сёмуха.

Тв.: Бел. пер. — у кн.: Прыйдзі, стваральны дух. Мн., 1986; Рус. пер. — Избранное. М., 1994; Стихотворения. Проза. Письма. СПб., 2000.

Літ.: Фюман Ф. Над огненной пучиной: Опыт с поэзией Г.Тракля // Магический кристалл. М., 1988; Дудова Л.В. Современники о творчестве Г.Тракля // Дудова Л.В., Михальская Н.П., Трыков В.П. Модернизм в зарубежной литературе. М., 1998; Гугнин А.А. Георг Тракль // Гугнин А.А. Австрийская литература XX в. Новополоцк; М., 2000. *Е.А.Лявонава.*

ТРАКТ ПАШТО́ВЫ (польск. trakt ад лац. traktus літар. — валачэнне), у Рэчы Паспалітай і Расіі шырокая палепшаная грунтавая дарога (шлях), якая злучала найважнейшыя населеныя пункты. Мела станцыі (пастаялыя двары) і верставыя слупы. Па Т.п. ішлі рэгулярныя перавозкі пасажыраў, грузаў, пошты (паштовыя Т.п. з паштовымі станцыямі). З 19 ст. Т.п. з цвёрдым пакрыццём наз. шашой (гл. таксама *Шашэйная дарога*).

Т.п. на Беларусі з'явіліся ў 16 ст. ў час стварэння пошты. У 1583 адкрыты паштовыя зносіны па Т.п. Варшава—Беласток—Гродна. У сувязі з адкрыццём у 1596 у Варшаве паштамта Т.п. звязалі Варшаву з усімі гарадамі Рэчы Паспалітай. Паводле *Андросаўскага перамір'я 1667* паміж Рэччу Паспалітай і Расіяй была ўстаноўлена паштовая сувязь Маскоўскай дзяржавы з Зах. Еўропай. Т.п. працягнуўся ад Масквы праз Смаленск—Магілёў—Мінск да Вільні. У канцы 17 ст. ў ВКЛ пачалі пракладваць новыя дарогі, будаваць станцыі, але *Паўночная вайна 1700—21* перашкодзіла давесці работы да канца. Паляпшэнне Т.п. пачалося пасля прыняцця вял. кн. ВКЛ і каралём Рэчы Паспалітай *Станіславам Аўгустам Панятоўскім* у 1764 Генеральнага рэгламента. У 1772 адкрыты часовы Т.п. Пскоў—Полацк, потым С.-Пецярбург—Нарва—Пскоў—Полацк—Талачын—Магілёў, на якім былі створаны 134 паштовыя станцыі (пазней Т.п. працягнуты да Кіева і Адэсы). У пач. 19 ст. ўсе дарогі Рас. імперыі былі падзелены на разрады: гал. паштовыя і пабочныя паштовыя (уласна гэта былі Т.п.), вял. праезджыя, ваен. і інш., якія таксама атрымалі нумары. Напр., паштовая дарога С.-Пецярбург—Екацярынаслаў, вядомая як Беларускі Т.п., мела №148. З крас. 1827 па Т.п. Беларусі пайшлі першыя дыліжансы. З 1830-х г. бел. Т.п. брукавалі каменнем. З развіццём чыг. транспарту значэнне Т.п. знізілася. Іншаземцы ў час вайны на бел. землях таксама будавалі Т.п. Гл. таксама *Пошта.* *У.К.Зарэмскі.*

ТРА́КТАР (англ. tractor ад лац. traho цягну), самаходная машына для перамяшчэння і прывядзення ў дзеянне агрэгатаваных з ёй прычэпных, навясных, паўнавясных або стацыянарных машын і прылад. Бываюць колавыя і гусенічныя; с.-г. (агульнага прызначэння, універсальна-прапашныя, спец. — садоваагародныя, вінаграднікавыя, балатаходныя, горныя і інш.), прамысл. (тралёвачныя, дарожна-буд.), транспартныя (цягачы з платформай і без яе).

Складаецца з каркаса (апора Т.), рухавіка, *трансмісіі* (уключае счапленне, *каробку перадач, галоўную перадачу, дыферэнцыял*, механізмы павароту), ходавой часткі (пераўтварае вярчальны рух у паступальны з дапамогай *колаў* ці *гусенічнага ходу*), механізма кіравання (руль, тармазы), рабочага і дапаможнага абсталявання (прычэпныя ўстройствы, навясная сістэма, вал адбору магутнасці, прывадны шкіў, ходапамяняшальнік, сістэмы блакіравання дыферэнцыяла, асвятлення і сігналізацыі, кантрольна-вымяральная апаратура і інш.). Колавыя Т. больш простыя па канструкцыі і ў эксплуатацыі, больш універсальныя, быстраходныя, але маюць горшую праходнасць. Таму часам выпускаюцца з усімі вядучымі коламі або са здымным абсталяваннем паўтусенічнага ходу. Гусенічныя маюць высокую праходнасць і добрыя цягавыя паказчыкі, недахопы — вял. маса і нізкая зносаўстойлівасць гусенічнага ходу. На Т. устанаўліваюць пераважна *дызелі*, часам карбюратарныя *рухавікі ўнутранага згарання*, выкарыстоўваюць мех. і гідрамех. перадачы, для кіравання рабочымі органамі навясных машын — гідранавясныя сістэмы. Сельскагаспадарчыя Т. агульнага прызначэння выкарыстоўваюць пераважна для *ворыва, сяўбы, культывацыі*, уборкі с.-г. культур; універсальна-прапашныя — у асн. для *міжрадковай апрацоўкі глебы* і ўборкі прапашных культур. Асаблівасць прапашных Т. — праходнасць у міжрадкоўях пасеваў без пашкоджання раслін з-за адпаведнай шырыні колаў (гусеніц), дарожнага прасвету, абрысу, рэгулюемай каляіны. Паводле цягавага намагання Т. ў краінах СНД падзяляюцца на 10 класаў: клас 0,2 (намаганне 2 кН); 0,6 (6 кН); 0,9 (9 кН); 1,4 (14 кН); 2 (20 кН); 3 (30 кН); 4 (40 кН); 5 (50 кН); 6 (60 кН); 8 (80 кН). Кожны клас Т. складаецца з групы машын, канструкцыйна уніфікаваных і з прыкладна аднолькавымі цягавымі ўласцівасцямі. Асн. (найб. пашыраная) мадэль групы наз. базавай; мадыфікацыя — Т., уніфікаваны з базавай мадэллю па асн. зборачных адзінках і сістэмах. На с.-г. Т. устаноўлены мех. каробкі перадач з лікам перадач да 32, у асн. з шасцярнямі пастаяннага зачаплення. Ёсць бесступеньчатыя трансмісіі з гідрастат. і гідрамех. перадачамі. Для паніжаных тэхнал. скарасцей трансмісія абсталёўваецца ходапамяняшальнікам. Эксплуатацыйныя паказчыкі Т. падзяляюцца на тэхніка-эканам. (прадукцыйнасць у агрэгаце, расход паліва на адзінку работы), тэхн. (клас, магутнасць рухавіка, цягавыя ўласцівасці і інш.), агратэхн. (удз. ціск на глебу, праходнасць у міжрадкоўях, манеўранасць у агрэгаце), эрганамічныя (умовы працы, працаёмістасць тэхн. абслугоўвання) і інш.



Трактары: 1 — колавы з рухавіком унутранага згарання (1901, ЗША); 2 — СХТЗ на суцэльнастальных колах (1931, Харкаў); 3 — трохколавы «Універсал» (1934, Ленінград); 4 — першы «Беларусь» МТЗ-2 (1953, Мінск).

Першыя колавыя Т. з паравым рухавіком з'явіліся ў 1830 у Вялікабрытаніі і Францыі (выкарыстоўваліся ў с.-г. і ваен. справе), з рухавікамі ўнутр. згарання — у 1901 у ЗША, гусенічныя — у 1912 у ЗША, затым у інш. краінах. У Расіі гусенічны Т. з 2 паравымі машынамі пабудаваны ў 1888. У СССР Т. «Фардзон-Пуцілавец» выпушчаны ў 1923 на ленінградскім з-дзе «Чырвоны пуцілавец». Масавая вытв-сць Т. пачалася з пускам Сталінградскага (1930), Харкаўскага (1931) трактарных з-даў (гл. *Трактарабудаванне*).

На Беларусі Т. магутнасцю ад 11 да 300 к.с. выпускае *Мінскі трактарны завод*: з 1950 гусенічныя і тралёвачныя, з 1953 колавыя с.-г. Т. «*Беларусь*», у т.л. першы МТЗ-2, з 1961 — МТЗ-50, з 1974 — МТЗ-80/82, з 1984 — МТЗ-100/102, пазней «Беларусь-1025», з 1993 — Т. серыі 900, з 1995 — «Беларусь-1221», з 2000 — «Беларусь-1522»; таксама ма-

лагабарытныя Т. («Беларус-320А», -321», -320», -220»), нізкапрофільныя («Беларус-530/532»), нізкаклірэнсныя («Беларус-82Н»), лесагаспадарчыя («Беларус Л-82»), тралёвачныя («Беларус ТТР-401»), рысаводчыя («Беларус-82Р»), міні-Т. («Беларус-082 БС») і інш.

Літ.: Конструкция, основы теории и расчет тракторов. М., 1971; Колесные тракторы. М., 1974; Тракторы «Беларусь» МТЗ-80, МТЗ-80Л, МТЗ-82, МТЗ-82Л. 2 изд. Мн., 1982; Мелиоративные, строительные и лесные тракторы. Мн., 1989.

В.М.Кандрацьеў, М.Р.Мялешка.

ТРАКТАРАБУДАВА́ННЕ, галіна машынабудавання па вытв-сці *трактароў*, тракторных і камбайнавых рухавікоў, уніфікаваных вузлоў, агрэгатаў, запасных частак і дэталяў да іх. Як галіна прам-сці існуе з 1917, калі на з-дах Форда ў ЗША пачаўся масавы выпуск трактароў.

У Еўропе масавая вытв-сць трактароў пачалася ў 1920-я г. ў Германіі, Італіі, Францыі і інш. У СССР упершыню наладжана ў 1923 на з-дзе «Чырвоны пуцілавец» у Петраградзе. У 1930 пабудаваны Сталінградскі, у 1931 — Харкаўскі трактарныя з-ды, якія выпускалі колавыя трактары; у 1933 на Чэлябінскім трактарным з-дзе наладжана вытв-сць гусенічных трактароў (з 1936 — з дызельным рухавіком). У 1937 на выпуск трактароў на гусенічным ходу перайшлі Сталінградскі і Харкаўскі з-ды. У 1942—44 пабудаваны Алтайскі, Уладзімірскі, Ліпецкі трактарныя з-ды. У 1950-я г. ўведзены ў дзеянне Мінскі, Анежскі, Ташкенцкі і інш. трактарныя з-ды; павялічылася вытв-сць трактароў агульнага прызначэння. У 1960-я г. ўсе з-ды перайшлі на выпуск трактароў з дызельнымі рухавікамі. Стварыліся уніфікаваныя мадэлі трактароў, што спрыяла вылучэнню вытв-сці іх асобных вузлоў, дэталяў, агрэгатаў, рухавікоў у спецыя-


1


2


3


4


5


6


7


8


9


10


11


12

Трактары: 1 — універсальна-прапашны «Беларусь-82» (Мінск); 2 — балатаходны ДТ-75Б (г. Валгаград); 3 — прамысловы дызель-электрычны ДЭТ-250 (Чэлябінск); 4 — ворыўны Т-150К (Харкаў); 5 — агульнага прызначэння К-701 (С.-Пецярбург); 6 — балатаходны з задняй гідрасістэмай Т-130БГ-3 (Чэлябінск); 7 — агульнага прызначэння ДТ-175С (Валгаград); 8 — тралёвачны «Беларус ТТР-401», 9 — малагабарытны «Беларусь-321», 10 — гусенічны «Беларус-1802» (Мінск); 11 — «Вальтра» з падвойнымі коламі (Фінляндыя); 12 — тракавага тыпу Д10 (ЗША).

лізаваныя прадпрыемствы. Пабудаваны з-ды ў Валгаградзе, Мінску, Барнауле, Харкаве, Нагінскі з-д паліўнай апаратуры (паліўныя помпы для трактарных рухавікоў), арэнбургскі з-д «Трактаразапчастка» і інш. З 1990-х г. асноўная ўвага аддаецца павышэнню універсальнасці трактароў, іх надзейнасці і даўгавечнасці, пашырэнню дыяпазону магутнасці рухавікоў (ад 10 да 450 к.с.), зніжэнню ўдз. расходу паліва, забеспячэнню аховы навакольнага асяроддзя ад неспрыяльных уздзеянняў машын, стварэнню камфортных і бяспечных умоў працы трактарыста і інш.

На Беларусі Т. — адна з найважнейшых галін машынабудавання. Серыйная вытв-сць трактароў (КД-35) пачалася на *Мінскім трактарным заводзе* ў 1950. У 1972 створана ВА «Мінскі трактарны завод», у склад якога ўваходзяць *Бабруйскі завод трактарных дэталяў і агрэгатаў, Віцебскі завод трактарных запасных частак*, Мінскі з-д спецінструменту і тэхнал. аснасткі, Смаргонскі агрэгатны з-д. Запчасткі, вузлы, агрэгаты, дызельныя рухавікі для трактароў і інш. выпускаюць таксама *Мінскі маторны завод, Гомельскі завод пускавых рухавікоў, Мінскі завод шасцерняў, Барысаўскі завод агрэгатаў, Барысаўскі завод аўтатрактарнага абсталявання* і інш. Да 2002 ВА «Мінскі трактарны з-д» выпусціла больш як 3 млн. трактароў, з якіх каля 600 тыс. пастаўляліся ў 100 краін свету, у т.л. ЗША, Канаду, Германію, Францыю, Венгрыю, Грэцыю і інш. На аб'яднанні наладжана вытв-сць 24 мадэляў універсальна-прапашных трактароў магутнасцю ад 50 да 150 к.с., 6 мадэляў малагабарытных трактароў магутнасцю ад 20 да 25 к.с., 8 мадэляў *матаблокаў* і мінітрактароў магутнасцю ад 6 да 12 к.с., 15 мадэляў спец. машын: камунальных, пагрузачных, шахтавых, для лясной прам-сці. Трактары «Беларус» агрэгатуюцца з больш як 550 машынамі і прыладамі рознага прызначэння. Упершыню на МТЗ ствараюцца трактары агульнага прызначэння магутнасцю ад 155 да 260 к.с. У 2000 усе 13 трактарных з-даў былога СССР выпусцілі 47 тыс. трактароў, з якіх 23 тыс. выраблены на Мінскім трактарным з-дзе. Т. найб. развіта ў ЗША, Вялікабрытаніі, Германіі, Італіі, Японіі і інш. Буйнейшыя фірмы (1999): «Нью-Холанд» (54 тыс. трактароў за год), «Джон Дзір» (28 тыс.), «Масі Фергюсан» (27,7 тыс.), «Дойц» (24,4 тыс.), «Ландзіні» (18 тыс.), «Кейс» (17 тыс. трактароў за год) і інш. ВА «Мінскі трактарны завод» уваходзіць у лік 8 вытворцаў трактароў свету, якія забяспечваюць 96% агульнага аб'ёму сусв. рынку збыту гэтай тэхнікі.

П.І.Рогач.

ТРАКТА́Т (ад лац. tractatus абмеркаванне, разгляд) 1) навуковая праца, у якой разглядаецца асобнае пытанне ці праблема; разважанне на вызначаную тэму. 2) Адна з форм міжн. дагавораў (напр., берлінскі трактат 1878).

ТРАКТРЫ́СА (новалац. tractrix ад лац. tractus выцягнуты), плоская крывая, для якой даўжыня адрэзка датычнай ад пункта дотыку да зададзенай прамой (восі) ёсць велічыня пастаянная. Ураўненне ў прамавугольных дэкартавых каардынатах мае выгляд: $x = \pm [\sqrt{a^2 - y^2} - a\ln(a + \sqrt{a^2 - y^2}/y)]$. Пры вярчэнні Т. вакол яе восі атрымліваецца *псеўдасфера*.



Графік **трактрысы**

$x = \pm [\sqrt{a^2 - y^2} - a\ln(a + \sqrt{a^2 - y^2}/y)]$, M — пункт дотыку.



Схема рыбалоўнага **трала**: 1 — ваер; 2 — распорны шчыт; 3 — кабель; 4 — бабінец; 5 — цэнтральная частка трала.

ТРАЛ (ад англ. trawl), 1) р ы б а л о ў н ы — мешкападобная сетка, што буксіруецца рыбалоўным суднам (*траўлерам*) з дапамогай тросаў (ваераў); найб. пашыраны сродак лоўлі марской рыбы. 2) Г і д р а л а г і ч н ы Т. — прыстасаванне, якім знаходзяць падводныя перашкоды. Пры зачапленні Т. за перашкоду дзейнічае аўтам. механізм, з дапамогай якога над перашкодай ставіцца спец. навігацыйны знак (вяха). 3) М і н н ы Т. — спец. прыстасаванне для выяўлення і знішчэння мін (гл. *Тральшчык*).

ТРАЛЕ́ЙБУС (англ. trolleybus ад trolley кантактны провад + bus аўтобус), вагон на колавым ходу з пнеўматычнымі шынамі і з прыводам ад электрарухавіка; від гарадскога (часам міжгародняга) бязрэйкавага эл. транспарту. Бываюць пасажырскія і грузавыя.



Тралейбус (Мінскі аўтамабільны завод).

Сілкуецца пастаянным токам напружаннем 500—600, часам 750 В. Ток да цягавых электрарухавікоў паступае ад кантактнай сеткі праз падвесныя (тралейныя) правады і штангавыя токаздымальнікі. Спалучае перавагі *трамвая* (электрацяга, адсутнасць выхлапных газаў) і аўтобуса (лёгкасць і бясшумнасць ходу, магчымасць абгону). Скорасць да 70 км/гадз. Т. створаны ў Германіі ў 1882; у СССР — з 1933, у Маскве з 1934. На Беларусі Т. працуе ў Мінску (з 1952), Гомелі (1962), Магілёве (1970), Гродне (1974), Бабруйску (1978), Віцебску (1978), Брэсце (1981). Т. выпускае ВА «Белкамунмаш» і Мінскі аўтамаб. з-д. Гл. таксама *Гарадскі транспарт*.

С.В.Багдановіч.

ТРАЛЁЎКА л е с а м а т э р ы я л а ў (ад ням. treilen цягнуць), перамяшчэнне ссечаных дрэў з кронамі, хлыстоў (ствалоў) і сартыментаў ад месца валкі (*леса-*



а б

Машыны для **тралёўкі** лесаматэрыялаў: а — бясчокерная тралёвачная машына ЛП-18А (1 — маніпулятар; 2 — увязачнае прыстасаванне, 3 — шчыт, 4 — захоп); б — тралёвачная машына «Беларус МЛ-127С».

секі) да лесапагрузачнага пункта або лесавознай дарогі.

Ажыццяўляецца тралёвачнымі трактарамі або валачна-тралёвачнымі машынамі і лябёдкамі з тросаблочнымі сістэмамі. Трактары абсталёўваюцца лябёдкамі, тросамі з крукамі і кольцамі (чокерамі) на канцах, пагрузачнымі шчытамі або гідраманіпулятарамі. У час Т. дрэвы і хлысты абапіраюцца адным канцом на трактар, другі цягнецца па зямлі. Гл. таксама *Лесанарыхтоўчыя работы*.

ТРАЛЛЕ́ Ігар Яўгенавіч (н. 1.12.1949, Мінск), бел. фізік. Д-р фіз.-матэм. н. (1997). Скончыў БДУ (1971). З 1971 у Ін-це цвёрдага цела і паўправаднікоў, з 1976 у Фіз.-тэхн. ін-це Нац. АН (з 1996 заг. аддзела). З 1997 працуе за мяжой. Навук. працы па фізіцы цвёрдага цела і мікраэлектроніцы. Распрацаваў квантавую тэорыю пераносу носьбітаў зараду ў высокачастотным полі структур паўправаднік — дыэлектрык, прапанаваў спосаб фарміравання квантавых ям і квантавых кропак.

Тв.: Усиление плазменных колебаний в многослойных структурах с периодическими управляющими электродами // Докл. АН БССР. 1991. Т. 35, №2; Пучковая неустойчивость и усиление волн пространственного заряда в плазме полупроводников (разам з В.А.Сізюком) // Там жа. 1994. Т. 38, №4.

М.П.Савік.

ТРА́ЛЬШЧЫК, баявы карабель для пошуку і знішчэння марскіх (рачных) мін з дапамогай *тралаў* і для правядзення караблёў (суднаў) праз мінныя загароды. Належыць да мінна-тральных сіл ВМФ (ВМС) многіх дзяржаў.

Падзяляюцца на эскадраныя (будавалі да 2-й сусв. вайны), марскія, базавыя, рэйдавыя, рачныя, катэрныя. Водаўмяшчальнасць да 1300 т і больш, скорасць да 18 (на паветр. падушцы 30) вузлоў, далёкасць плавання да 3—5 тыс. міль. Гал. ўзбраенне — процімінае (кантактныя і некантактныя тралы, шукальнікі-знішчальнікі мін і інш.); ёсць малакаліберныя артыл. або зенітныя ўстаноўкі, буйнакаліберныя кулямёты, пускавыя ўстаноўкі процілодачных ракет, бомбакідальнікі. Маюць маламагн. дызельныя энергет. ўстаноўкі. Карпусы робяць з немагн. сплаваў, дрэва, шклапластыку і інш.

На Беларусі ў 1919—44 баявое траленне праводзілі рачныя Т. (пераабсталяваныя параходы) і катэры-Т., што меліся ў складзе рачных ваен. флатыліі (савецкіх Дняпроўскай і Пінскай, польскай Пінскай). У 1927—30 і 1935 у Пінску (Зах. Беларусь) для патрэб польскай Пінскай флатыліі пабудаваны 7 рачных Т. водаўмяшчальнасцю 4,8 і 10,2 т. *У.Я.Калаткоў, Р.К.Паўловіч.*

ТРАМБАВА́ЛЬНАЯ МАШЫ́НА, будаўнічая машына для паслойнага ўшчыльнення грунту пры стварэнні земляных насыпаў, буд-ве дамбаў, дарог, аэрадромаў і інш. Адрозніваюць Т.м.: са свабодным падзеннем рабочага органа (ушчыльняльнага грузу) — малатковыя машыны, каткі з падаючымі грузамі, трамбавальныя пліты на базе экскаватараў, трактароў ці кранаў; прымусовага дзеяння — дызельныя трамбоўкі, машыны з эл. і пнеўматычнымі прывадамі. У цяжкадаступных месцах выкарыстоўваюць трамбавальныя вібрацыйныя пліты.

ТРАМБАГЕ́Н, бялок плазмы крыві, тое, што *пратрамбін*.

ТРА́МБАЛ (Trumbull) Джон (6.6.1756, г. Лебанан, штат Канектыкут, ЗША — 10.11.1843), амерыканскі жывапісец. Вучыўся ў Лондане ў Б.Уэста. Удзельнік Вайны за незалежнасць (1775—83), ад'ютант Дж.Вашынгтона. У 1794—1804 і 1808—15 жыў у Лондане. У 1817—36 узначальваў Амер. акадэмію прыгожых мастацтваў у Нью-Йорку. Аўтар невял. тонкіх рэаліст. партрэтаў удзельнікаў вызв. вайны, у т.л. Р.Ізарда, і патрыятычных гіст. карцін («Бітва пры Банкерс-Хіле», «Дэкларацыя незалежнасці», 1786—94).

ТРАМБАЦЫ́ТЫ (ад *тромб* + грэч. kytos клетка), крывяныя пласцінкі, форменныя элементы крыві пазваночных жывёл і чалавека. У многіх жывёл Т. — дробныя акруглыя клеткі са шчыльным ядром; у млекакормячых жывёл і чалавека — бяз'ядзерныя, дыскападобныя пласцінкі дыям. 2—5 мкм. У 1 мм^3 крыві чалавека змяшчаецца 180—320 тыс. Т. Адрозніваюць 5 асн. відаў Т.: маладыя (1—5%), спелыя (88%), старыя (4%), дэгенератыўныя (да 2%), гіганцкія формы раздражнення (2%). Утвараюцца ў чырв. касцявым мозгу (66—80 тыс. у 1 мм^3 крыві за дзень). Функцыі Т.: спыненне крывацёку пры пашкоджанні сценкі сасудаў, забеспячэнне *згусальнасці крыві*, удзел у гаенні ран і інш. Памяншэнне колькасці Т. суправаджаецца *дыятэзам гемарагічным*, павелічэнне вядзе да *трамбозу* крывяносных сасудаў. *А.С.Леанцюк.*



1



2

Рачныя **тральшчыкі** польскай Пінскай флатыліі, якія будаваліся ў Пінску ў 1927—35: 1 — браніраваны; 2 — колавы.

ТРАМБІ́Н, трамбаза, фібрын-фермент, пратэалітычны фермент класа *гідралаз*; найважн. кампанент сістэмы згусання крыві. Утвараецца ў плазме крыві са свайго неактыўнага папярэдніка *пратрамбіну*. Складаны бялок з 2 поліпептыдных ланцугоў з малекулярнай масай 34 000. Забяспечвае пераўтварэнне фібрынагену ў *фібрын*; выкарыстоўваецца як мясц. кроваспыняльны сродак.

ТРАМБЛЕ́ (Tremblay) Мішэль (н. 25.6.1942, г. Манрэаль, Канада), канадскі пісьменнік. Піша на франц. мове, блізкай да жаргону простых людзей прав. Квебек. Уплыў драматургіі еўрап. нар. рэаліст. т-ра адчувальны ў п'есах «Цягнік» (1964), «Сястрынае сэрцайка» (1968), «Заўсёды твая Мары-Лу» (1971), «Добры дзень, ну, добры дзень» (1974), «Альберціна і пяць часін» (1984), «Ці гэта сапраўдны свет?» (1987), для якіх характэрны іранічны паказ спажывецкай псіхалогіі «людзей з народа». Аўтар раманаў «Тоўстая жанчына побач — цяжарная» (1978), «Навіны ад Эдуарда» (1984) і інш. *Л.П.Баршчэўскі.*

«ТРА́МБЛЯ», «Трамблянкі», бел. нар. танец, разнавіднасць *полькі*. Муз. памер 2/4. Тэмп жвавы. Выконвалася з паваротамі па крузе і мудрагелістымі прытупваннямі. Запісана ў канцы 19 ст. ў в. Васілішкі (Шчучынскі р-н Гродзенскай вобл.), адна з першых зафіксаваных дробных полек.

ТРАМБО́З (ад грэч. thrombōsis згортванне), утварэнне *трамбаў* у поласцях сэрца і сасудах (часцей у венах). Напр., Т. у сістэме каранарнага кровазвароту вядзе да *інфаркта міякарда*, Т. сасудаў мозга — да *інсульту*.

Бывае пры мясц. зменах сасудаў — траўма, запаленне, атэрасклероз, запавольванне руху крыві (напр., варыкознае расшырэнне вен); пры агульных фактарах: актывацыя згусальнай і прыгнечанне процізгусальнай сістэмы крыві, павелічэнне ў крыві колькасці фібрынагену, трамбацытаў, тлушчаў, павелічэнне вязкасці крыві. Прыкметы залежаць ад месца Т. і парушэння кровазвароту (боль, ішэмія, непрытомнасць). Лячэнне тэрапеўт., хірургічнае. *І.М.Семяненя.*

ТРАМБО́Н (італьян. trombone ад tromba труба), медны духавы мундштуковы нетранспануючы муз. інструмент. Мае шырокія мензуру і канічны раструб, які ў вузкай частцы злучаны з рассоўным механізмам, што ўключае 2 нерухомыя трубкі (штангі), на якія насоўваецца U-падобная куліса. Рухомае прыстасаванне забяспечвае храматычны гукарад. Існуюць Т. рассоўны (цуттрамбон) і вентыльны. 6 разнавіднасцей — ад сапрана да кантрабаса. У наш час выкарыстоўваюцца тэнаравыя і тэнарава-басовыя, радзей басовыя Т. Ужываецца пераважна як арк. (Т. складае самаст. групу ў традыц. складзе эстр. аркестра «big band», эстр.-сімф.), зрэдку як сольны інструмент.

Продкам Т. лічыцца стараж.-рым. букцына (з сям'і труб). У інш. краінах Еўропы вядомы з 15 ст. Сям'я Т. сфарміравалася ў 16 ст.

На Беларусі Т. вядомы з 18 ст. ў складзе езуіцкіх капэл, з 19 ст. — у аматарскіх аркестрах навуч. устаноў: Гомельская муз. школа (Мацей Красоўскі, Ян Сураж), Мінская мужчынская гімназія (Восіп Шаскольскі), 1-е Мінскае гар. 4-класнае вучылішча (Шыменеў); духавога аркестра Мінскага вольна-пажарнага т-ва, ваен. аркестраў. З пач. 20 ст. пашыраны ў прафес. і аматарскіх аркестрах, ансамблях.

Літ.: Вилковир Е. Практический курс инструментовки для духового оркестра. М., 1963; Левин С. Духовые инструменты в истории музыкальной культуры. Л., 1973.

А.Л.Карацееў.

ТРАМВА́Й (англ. tramway ад tram вагон, цялежка + way пуць), рэйкавы наземны гарадскі электрычны транспарт. Вагон або некалькі (2—3) вагонаў (найчасцей маторныя) сілкуецца пастаянным токам напружаннем 500—750 В



Трамвай (ВА «Белкамунмаш»).

звычайна праз падве́сную кантактную сетку (адваротны провад — рэйкі); скорасць да 90 км/гадз.

У кантактную сетку эл. ток паступае ад лінейных *цягавых падстанцый*. Цягавыя электрарухавікі (2—8 на кожным маторным вагоне) атрымліваюць эл. энергію праз токапрыёмнік на даху вагона, маюць магутнасць па 30—70 кВт. Вагоны бываюць маторныя (з токаздымальнікам, які слізгае па кантактным провадзе), прычапныя і счленены; двух-, чатырох-, шасці- і васьмівосевыя (звычайна 4-восевыя). Рэйкавы пуць шыр. 1524 мм (вузкакалейны 1000 мм). Часам на базе вагонаў Т. ствараюць спецыялізаваныя вагоны (рэйкашліфавальныя, снегаачышчальнікі, грузавыя). Першы доследны вагон Т. пабудаваны ў Пецярбургу (1880), першы трамвайны рух арганізаваны ў Ліхтэрфільдэ (паблізу Берліна) у 1881. Т. пачаў працаваць у 1892 у Кіеве, у 1894 у Львове, у 1899 у Маскве.

На Беларусі буд-ва трамвайных ліній пачата ў Віцебску, дзе ў 1898 пачаты рух на 4 лініях (18 маторных і 16 прычапных вагонаў). У Мінску пушчаны ў 1929, у Наваполацку — у 1974 (скарасны), у Мазыры — у 1988. Вытв-сць Т. наладжана ў ВА «Белкамунмаш».

С.В.Багдановіч.

ТРАМПЛІ́Н (франц. tremplin ад італьян. trampolino, ад trampolo хадулі), спартыўны снарад (прылада) або збудаванне, якое забяспечвае павелічэнне аблегласці палёту спартсмена ў момант скачка. Адрозніваюць Т. для гімнастычных скачкоў, скачкоў на лыжах, водных лыжах, у ваду, фрыстайле і інш. Т. гімнастычны — спружыністая нахілена пастаўленая дошка, якая выкарыстоўваецца ў гімнастыцы, акрабатыцы для ўзмацнення адскоку ад апоры. Т. для скачкоў на лыжах — спарт. збудаванне, якое складаецца з гары разгону з верт. уступам і гары прызямлення, што пераходзіць у гарызантальную пляцоўку. Абсталёўваецца пад'ёмнікам (ліфт, канатная дарога і інш.). У залежнасці ад прызначэння (для абучэння ці спарт. удасканаленасці) т.зв. магутнасць Т. (аптымальная даўж. скачка, на якую разлічаны Т.) бывае да 120 м і больш. Існуюць прыродныя (на схіле гары), штучныя (на эстакадах) і камбінаваныя. Т. для скачкоў у ваду — дошка даўж. 4,8—5 м, шыр. 0,5 м, якая прымацоўваецца да рамы скачковай вышкі на выш. 1 і 3 м ад паверхні вады. Адзін канец яе замацоўваецца шарнірна ці жорстка, у сярэдняй ч. абапіраецца на валік, што дае магчымасць мяняць жорсткасць і амплітуду ваганняў дошкі. Т. для скачкоў на водных лыжах — пакаты нахілены памост з гладкай паверхняй, даўж. да 6,7 м, шыр. каля 4 м, выш. над вадой да 1,8 м у мужчын і да 1,5 м у жанчын. Т. трохступеньчаты — снарад для наземнага навучання і трэніроўкі парашутыстаў. Дае магчымасць выпрацоўваць навыкі прызямлення.



Трамбон рассоўны.

ТРАНЁЎ Канстанцін Андрэевіч (2.6.1876, с. Бакшэеўка Харкаўскай вобл., Украіна — 19.5.1945), рускі пісьменнік, драматург. Скончыў пецярбургскія духоўную акадэмію і археалагічны ун-т (1903), Таўрыйскі ун-т (1921). У 1904—18 настаўнічаў. Друкаваўся з 1898. У апавяданнях, п'есе «Ад чаго парваліся струны?» (1910, пазнейшая назва «Дарогіны»), аповесці «Валадар» (1912) тэмы сял. жыцця, лёсу інтэлігенцыі. Пасля 1917 працаваў як драматург. Аўтар гіст. і гіст.-рэв. п'ес «Пугачоўшчына» (паст. 1925), «Ясны лог» (паст. 1931), «Гімназісты» (1936), «На беразе Нявы» (паст. 1937), «Насустрач» (1943), «Юнацтва Пятра» (няскончана; выд. 1946), «Палкаводзец» (паст. 1945), камедыі «Жонка» (паст. 1928), сац.-псіхал. «Ганна Лучыніна» (паст. 1946). Найб. вядома яго драма пра грамадз. вайну «Любоў Яравая» (паст. 1926; новая рэд. паст. 1936, Дзярж. прэмія СССР 1941; аднайм. фільм 1970), у якой сац. і індывідуальная псіхалогія герояў пададзена праз сямейна-быт. калізіі. На бел. сцэне пастаўлены «Любоў Яравая» (1936, БДТ-2, Дзярж. рус. драм. т-р), «Ганна Лучыніна» (1956, Бел. т-р імя Я.Коласа).

Тв.: Повести и рассказы. М., 1977; Пьесы. Статьи. Речи. М., 1980.

Літ.: Файнберг Р.И. К.А.Тренев. М.; Л., 1962; Живой Тренев: Сб. воспоминаний. 2 изд. Ростов н/Д, 1976.

Л.В.Календа.

ТРАНЗІ́СТАР [англ. transistor ад tran(sfer) пераносіць + (re)sistor супраціўленне], паўправадніковая прылада для ўзмацнення, генерацыі і пераўтварэння эл. ваганняў; асн. элемент мікраэлектроннай апаратуры (гл. *Мікраэлектроніка*). Асн. класы Т. — уніпалярныя і біпалярныя.

Уніпалярныя (палявыя, ці канальныя) Т. створаны ў 1950—70-я г. на аснове работ амер. вучоных У.Шоклі, С.Міда, Д.Канга і інш. і ўяўляюць сабой паўправадніковы крышталь, размешчаны паміж 2 амічнымі кантактамі (сцёкам і вытокам), эл. ток паміж якімі абумоўлены носьбітамі зараду аднаго знака (электронамі ці дзіркамі) і змяняецца пад уздзеяннем папярочнага эл. поля



Схема **транзістара**: а — біпалярнага (1 — эмітэр; 2 — база; 3 — калектар; 4 — вобласць праставага зараду); б — уніпалярнага з кантактам метал — паўправаднік (1 — выток; 2 — затвор; 3 — сцёк; 4 — вобласць праставага зараду; 5 — вобласць канала; 6 — высакаомны паўправаднік); в — уніпалярнага з ізаляваным затворам (1 — выток; 2 — затвор; 3 — сцёк; 4 — ізалятар; 5 — вобласць праставага зараду; 6 — вобласць канала).

ўваходнага сігналу. Біпалярныя Т. вынайдзены амер. вучонымі У.Шоклі, У.Братэйнам і Дж.Бардзіным (1948). Эл. ток у іх абумоўлены носьбітамі зарадаў абодвух знакаў (электронамі і дзіркамі). Такі Т. уяўляе сабой крышталь паўправадніка, дзе створаны 3 вобласці з *n*- і *p*-тыпам праводнасці, да якіх падведзены метал. вывады. У залежнасці ад парадку чаргавання гэтых абласцей адрозніваюць Т. *n-p-n*- і *p-n-p*-тыпаў. Сярэдняя тонкая вобласць (база) аддзелена ад астатніх (калектара і эмітэра) *электронна-дзірачнымі пераходамі*. Уваходны сігнал падаецца на базу і выклікае перанос неасноўных носьбітаў зараду ад эмітэра да калектара. Таксама Т. часта наз. партатыўныя радыёвяшчальныя прыёмнікі на паўправадніковых прыладах.

ТРАНЗІ́Т (ад лац. transitus праходжанне), перавозкі пасажыраў і грузаў з аднаго пункта ў другі праз прамежкавыя (транзітныя) пункты. На чыг. транспарце паняцце «Т.» ужываецца таксама да цягнікоў і асобных вагонаў, на рачным транспарце — пры перавозках у межах двух або некалькіх сумежных параходстваў. Транзітныя перавозкі бываюць змешаныя (напр., чыгунка ўдзельнічае разам з рачным ці марскім транспартам). Т. бывае пры зносінах унутры краіны і паміж асобнымі краінамі. На падставе міждзярж. пагадненняў пасажыры і грузы перавозяцца праз тэрыторыю інш. краіны ў трэцюю. На Т. некаторых грузаў (зброя, наркатычныя рэчывы і інш.) існуюць абмежаванні.

ТРАНЗІТЫ́ЎНАСЦЬ (ад лац. transitivus пераходны), уласцівасць бінарных суадносін «пераходзіць» з адных пар аб'ектаў на інш. Напр., калі велічыня *a* параўнальная з *b*, а *b* — з *c*, то *a* параўнальная з *c*.

ТРАНЗІ́ЦЫЯ (ад лац. transitio пераход, перамяшчэнне) у генетыцы, мутацыя, абумоўленая заменай азоцістай асновы ў малекуле нуклеінавай к-ты. Пры Т. адна пурынавая аснова замяняецца на другую (адэнін на гуанін, ці наадварот), або адна пірымідзінавая аснова на другую (тымін на цытазін ці наадварот). Адносіцца да генных мутацый, якія прыводзяць да змены сэнсу *кадона* і парушэнняў счытвання інфармацыі ў ланцужку ДНК. Часам Т. фенатыпічна не праяўляецца за кошт лішку генет. кода (адну амінакіслату кадзіруюць некалькі кадонаў). *Р.Г.Заяц.*

ТРАНКВІЛІЗА́ТАРЫ (ад лац. tranquillo супакойваю), лекавыя сродкі, якія ўплываюць на тармажэнне ў ц.н.с.; група *псіхатропных сродкаў*. Найб. ужываюцца хім. рэчывы, вытворныя бензадыязепіну — хлозепід (элениум), сібазон (седуксен, рэланіум), феназепам, назепам (тазепам), ксанакс і інш. Памяншаюць пачуццё страху, трывогі, псіхаэмацыянальнага напружання і інш. Валодаюць седатыўным, снатворным, працісутаргавым дзеяннем, расслабляюць мышцы. Выкарыстоўваюцца пры неўрозах і неўрозападобных станах, эпілепсіі, сутаргах, артэрыяльнай гіпертаніі, стэнакардыі і інш. Валодаюць пабочнымі эфектамі: выклікаюць санлівасць, мышачную слабасць, псіхічную і фіз. залежнасць. *І.М.Семяненя.*

ТРАНС... (ад лац. trans скрозь, цераз, за), першая састаўная частка складаных слоў, якая абазначае: рух цераз якую-н. прастору, перасячэнне яе (напр., *трансаўстралійская магістраль*); абазначэнне ці перадача пры дапамозе чаго-н. (напр., *транспірацыя*, транслітэрацыя); размяшчэнне па-за межамі чаго-н. (напр., транснацыянальны).

ТРАНС (франц. transe ад transir здранцвець), стан зацямнення свядомасці, пры якім аўтаматычна выконваюцца некат. дзеянні (нематываваныя або мэтанакіраваныя); таксама стан змрочнасці, экстазу, «яснабачання», «празорлівасці». Назіраецца гал. чынам пры эпілепсіі, істэрыі, глыбокім гіпнозе і інш. Перажытае звычайна не захоўваецца ў памяці (амнезія).

ТРАНСАВАНГА́РД (ад лат. *транс*... + *авангард*), плынь у жывапісе *постмадэрнізму*. Узнік у Італіі ў канцы 1970-х г. Гал. яго тэарэтык А.Беніта-Аліва прадставіў работы трансавангардыстаў на біенале 1980 і 1982 у Венецыі. Майстры Т. (С.Кія, Ф.Клементэ, Э.Кукі, Н. дэ Марыя, М.Паладзіна) супрацьпаставілі канцэптуальнай творчасці непасрэдную работу мастака над стварэннем карціны, такім чынам аднавіўшы цікавасць да жывапіснай выяўленчасці. *Я.Ф.Шунейка.*

ТРАНСАЗІЯ́ЦКАЯ АЎТАМАГІСТРА́ЛЬ. Злучае гарады Стамбул—Анкара (Турцыя)—Тэбрыз—Тэгеран—Керман—Мешхед (Іран)— Герат—Кабул (Афганістан)—Пешавар—Равалпіндзі (Пакістан)—Срынагар—Дэлі—Калькута (Індыя)—Дака (Бангладэш). Даўж. каля 9000 км. Пабудавана ў 1940—60-я г.

ТРАНСАЗІЯ́ЦКАЯ МАГІСТРА́ЛЬ, шыротная 2-калейная чыг. магістраль: Стамбул—Анкара (Турцыя)—Тэбрыз—Тэгеран—Керман—Захедан (Іран)—Квета—Лахор (Пакістан)—Дэлі—Канпур—Калькута (Індыя)—Дака—Чытагонг (Бангладэш). Даўж. больш за 7 тыс. км. Аб'ядноўвае чыг. сетку 5 краін. У Турцыі (Эдырне) стыкуецца з транс'еўрапейскай магістраллю «*Захад—Усход*».

ТРАНСАЛЯ́СКІНСКІ НАФТАПРАВО́Д. У ЗША, перасякае тэр. штата Аляска ад Паўн. схілу (Прадха-Бей) да нафтабазы Валдыз. Далей нафта ў марскіх танкерах ідзе на нафтаперапр. з-ды штата Каліфорнія. Пабудаваны ў 1974—77.

ТРАНСАМАЗО́НСКАЯ ШАША́ (Transamazonica Rodovia), найбуйнейшая трансп. магістраль Бразіліі: ад г. Жуан-Песоа, праз трапічныя лясы бас. р. Амазонка да гарадоў Рыу-Бранку і Крузейру-ду-Сул (граніца з Балівіяй і Перу). Даўж. каля 4400 км. Частка сістэмы аўтамагістралей, што злучаюць амазонскія штаты Бразіліі з марскімі партамі. Пабудавана ў 1970—74.

ТРАНСАМЕРЫКА́НСКАЯ МАГІСТРА́ЛЬ, шыротная 2-калейная чыг. магістраль: Сан-Паўлу—Карумба (Бразілія)—Санта-Крус—Ла-Пас (Балівія)—Антафагаста (Чылі). Даўж. больш за 3 тыс. км. Злучае парты Атлантычнага (у Бразіліі) і Ціхага акіянаў (у Чылі). Пабудавана ў 1920—30-я г.

ТРАНСАМІНАВА́ННЕ, зваротны перанос амінагрупы ад амінакіслот да кетакіслот, тое, што *пераамінаванне*.

ТРАНСАНТАРКТЫ́ЧНЫЯ ГО́РЫ (Transantarctic mountains), сістэма горных хрыбтоў у Антарктыдзе. Цягнецца амаль на 4 тыс. км ад усх. ўзбярэжжа м. Уэдэла да зах. ўзбярэжжа м. Роса; шыр. 200—600 км. Утвараюць мяжу паміж. Усх. і Зах. Антарктыдай. У сістэму Т.г. уваходзяць горы Пенсакола, Тыл, Хорлік, хрыбты Куін-Мод, Куін-Элізабет, Куін-Аляксандра і інш. Выш. 2000—3000 м, найб. — 4668 м (г. Яльмар-Юхансен у хр. Куін-Мод). Ніжні ярус складзены з крышт. парод, сярэдні — з асадкавых і магматычных, верхні — пераважна з пясчанікаў і гліністых сланцаў, з якімі звязаны радовішчы каменнага вугалю. Берагавы ўчастак Т.г. (на Зямлі Вікторыі) адкрыты англ. экспедыцыяй Дж.Роса ў 1841.

ТРАНСАЎСТРАЛІ́ЙСКАЯ МАГІСТРА́ЛЬ, шыротная 2-калейная чыг. магістраль: Сідней—Мельбурн—Адэлаіда—Перт у Аўстраліі. Даўж. 3160 км. Злучае парты Індыйскага і Ціхага акіянаў. Пабудавана ў 1910—20. Электрыфікавана ў 1970-х г.

ТРАНСВА́А́ЛЬ (Transvaal), рэспубліка, якую стварылі ў 1856 буры (афрыканеры) на Пн ад р. Вааль (афіц. назва — Паўд.-Афр. Рэспубліка). Пасля таго, як у 1860-я г. на тэр. Т. былі знойдзены алмазы, а ў 1880-я — золата, Вялікабрытанія імкнулася падпарадкаваць Т. У выніку *англа-бурскай вайны 1899—1902* анексіраваны Вялікабрытаніяй. Пасля стварэння ў 1910 Паўд.-Афр. Саюза (з 1961 *Паўднёва-Афрыканская Рэспубліка*) — адна з яго правінцый; у 1994 падзелены на некалькі больш дробных адм. адзінак.

ТРАНСВЕ́РСІЯ (ад лац. transversus павернуты ўбок, адведзены), мутацыя, абумоўленая заменай пурынавай асновы (адэнін, гуанін) на пірымідзінавую (тымін, цытазін) і наадварот. Адносіцца да генных мутацый. У адрозненне ад *транзіцыі* часам наз. складанай або перакрыжаванай заменай з-за змены арыентацыі пурын-пірымідзін у мутантным сайце двухланцужковай малекулы нуклеінавай к-ты. Адбываецца часцей за транзіцыі.

ТРАНСВЕСТЫ́ЗМ (ад *транс*... + лац. vestio апранаць), э а н і з м, імкненне да пераапранання ў адзенне процілеглага полу; адна з форм палавой ненармальнасці. У адрозненне ад *транссексуалізму* прыхільнікі Т. не жадаюць зменьваць свой пол. Праяўляецца пастаянна або перыядычна. Большасць прыхільнікаў Т. — гетэрасексуалы (гл. *Гетэрасексу-*

альнасць), таксама гомасексуалы (гл. *Гомасексуалізм*), бісексуалы (гл. *Бісексуальнасць*). Т. патрабуе псіхатэрапеўт. карэкцыі. *І.М.Семяненя.*

ТРАНСГІМАЛА́І, другая назва горнай сістэмы *Гандысышань* у Азіі.

ТРАНСГРАНІ́ЧНАЕ ЗАБРУ́ДЖВАННЕ, забруджванне навакольнага асяроддзя газападобнымі адходамі і пылам прамысл. прадпрыемстваў шляхам *трансгранічнага пераносу*, якое ахоплівае тэр. некалькіх краін або кантынентаў. На Беларусі адзначаецца з сярэдзіны 20 ст. (назіранні вядуцца з 1980). Краіна знаходзіцца ў неспрыяльных умовах з-за перавагі зах. і паўд.-зах. пераносу. Паводле мадэльных разлікаў на тэр. Беларусі штогод асядае 180—190 тыс. т серы (з іх 84—86% трансгранічнай), 60—70 тыс. т акісленага азоту (89—94% трансгранічнага), 150—170 тыс. т. адноўленага азоту (38—65% трансгранічнага), больш за 400 т свінцу (80% трансгранічнага). Асн. спосаб прадухілення Т.з. — змяншэнне колькасці шкодных выкідаў у атмасферу ва ўсіх краінах. На гэта накіраваны «Канвенцыя аб трансгранічным забруджванні паветра на вял. адлегласці» (1979; скарачэнне выкідаў дыаксідаў серы і аксідаў азоту), «Канвенцыя па ацэнцы ўздзеяння на навакольнае асяроддзе ў трансгранічным кантэксце (1998; скарачэнне выкідаў цяжкіх металаў, асабліва свінцу, кадмію, ртуці, і стойкіх арган. забруджвальнікаў — пестыцыдаў, прамысл. хімікатаў і інш.). *П.І.Лабанок.*

ТРАНСГРАНІ́ЧНЫ ПЕРАНО́С, распаўсюджванне газападобных адходаў і пылу прамысл. прадпрыемстваў і транспарту на вял. адлегласці, па-за межы краін, на тэр. якіх знаходзяцца крыніцы забруджвання. Адбываецца ў выніку дыфузіі, турбулентных патокаў або метэаралагічных ападкаў. Вядзе да ўзнікнення *трансгранічнага забруджвання.*

ТРАНСГРЭ́СІЯ мора (ад лац. transgressio пераход, перамяшчэнне), наступанне мора на сушу ў выніку яе апускання пад уздзеяннем *тэктанічных рухаў*, радзей падняцця ўзроўню акіяна; працэс, процілеглы *рэгрэсіі*. Складаецца з шэрагу менш працяглых наступанняў і адступанняў мора. Суправаджаецца абразіяй і ўтварэннем перарываў, вуглавых нязгоднасцей у асадканамнажэнні. Разрэз адкладаў пры Т. характарызуецца зменай знізу ўверх мелкаводных фацый больш глыбакаводнымі. Неаднаразова адбываліся ў геал. гісторыі Зямлі, лакальныя Т. назіраюцца і ў сучасны перыяд (напр., у Нідэрландах).

ТРАНСГРЭ́СІЯ ў генетыцы, павялічанае (ці аслабленае) праяўленне генет. прыкметы ў патомства ў параўнанні з бацькамі. Адбываецца, калі колькаснае праяўленне прыкметы звязана з функцыянаваннем 2 і болей генаў. Пры наяўнасці ў кожнага з бацькоў 1 ці болей дамінантнага гена ў патомкаў спалучаюцца 2 і болей дамінантных генаў — станоўчая Т.; аналагічнае спалучэнне рэцэсіўных генаў прыводзіць да аслаблення праяўлення прыкметы — адмоўная Т. (гл. *Дамінантнасць, Рэцэсіўнасць*). Выкарыстоўваецца ў *селекцыі.*

ТРАНСДУ́КЦЫЯ (ад лац. transductio перамяшчэнне), перадача генет. матэрыялу ад адной *бактэрыі* (донара) да другой (рэцыпіента) з дапамогай *бактэрыяфага*. Існуе ў многіх бактэрый: сальманел, шыгел, бацыл, актынаміцэтаў і інш. Умераныя фагі (бактэрыяфагі) у працэсе вегетатыўнага размнажэння здольныя выпадкова захопліваць і пераносіць у інш. клеткі любы ўчастак ДНК бактэрый, што яны разбураюць. У гэтым выпадку ўласная ДНК фага замяняецца на аналагічны па памерах фрагмент бактэрыяльнай храмасомы, які можа мець некалькі *генаў*. Пры чарговым заражэнні фагам бактэрыі ўчастак храмасомы донара пераносіцца ў клетку рэцыпіента. Выкарыстоўваецца ў генетычны бактэрый пры складанні генет. карт, для аналізу іх генет. структуры і функцыі.

ТРАНСЕ́ПТ (позналац. transeptum ад *транс...* + лац. septum агароджа), адзін ці некалькі папярочных *нефаў* у базілікальных і крыжовых у плане храмах, якія перасякаюць падоўжныя нефы; павялічваюць прастору інтэр'ера перад алтаром і апсідай. Узнік у раннехрысц. храмах Зах. Еўропы. На Беларусі найб. пашырыўся ў рэнесансавых і барочных базіліках з канца 16 ст. (*Чарнаўчыцкі Троіцкі касцёл, Нясвіжскі касцёл езуітаў*); вядомы і ў пабудовах класіцызму (*Магілёўскі Іосіфаўскі сабор*), несапраўднай готыкі (*Гервяцкі Троіцкі касцёл*) і інш. Часам на перакрыжаванні гал. нефа і Т. будавалі купал (*Гомельскі Петрапаўлаўскі сабор* і інш.) або невял. вежу-сігнатурку (касцёл *Пінскага касцёла і кляштара францысканцаў* і інш.). Пераход ад падоўжных нефаў да Т. ў купальных пабудовах афармляўся падпружнымі аркамі сяродкрыжжа.



Трансепт.

ТРАНСІАРДА́НІЯ, назва дзяржавы *Іардані́я* да 1946.

ТРАНСІЛЬВА́НІЯ (Transilvania), Заалессе, гістарычная вобласць у цэнтры і на З Румыніі, паміж Усх. і Паўд. Карпатамі і Зах. Румынскімі гарамі. Пераважную частку тэр. займае *Трансільванскае плато*. Рэльеф узгорысты. Радовішчы гаручых газаў і кам. солі. Пасевы пшаніцы, тытуню, цукр. буракоў. Асн. гарады і прамысл. цэнтры: Клуж-Напока, Брашоў, Сібіў, Тыргу-Мурэш.

З 2-й пал. 1-га тыс. да н.э. тут жылі *геты* і *дакі*, якія ў 4—1 ст. да н.э. ўтваралі плем. саюзы. У канцы 1 ст. н.э. ўзнікла гета-дакійская дзяржава цара *Дэцэбала* [87—106] з цэнтрам у Т. і сталіцай у г. Сармізегетуза. У 106 яна заваявана Рымам і ператворана ў рым. правінцыю *Дакія*, мясц. насельніцтва раманізавана. У 271 рымляне пакінулі Т., дзе ў 3—6 ст. праходзілі і часткова асядалі *готы, гуны, авары* і інш., у 6—7 ст. з'явіліся паселішчы славян. У 6—8 ст. Т. ў складзе Аварскага каганата. Да 9 ст. ў Т. і ў суседняй *Валахіі* ў выніку асіміляцыі плямён утварылася ўсх.-раманская народнасць улахаў (валахаў) — продкаў сучасных румын і малдаван. З 11—12 ст. Т. падуладная каралям Венгрыі, якія перасялілі сюды частку венг. сялян. У працэсе заваявання Венгрыі Турцыяй Т. ў 1541 вылучылася ў асобнае княства пад сюзерэнітэтам тур. султана. Князь Т. Іштван Батары [1571—86] з 1575 адначасова быў каралём Польшчы і вял. князем ВКЛ пад імем *Стафана Баторыя*. Паводле рашэнняў *Карлавіцкага кангрэса 1698—99* Т. ўвайшла ў склад уладанняў аўстр. *Габсбургаў*. З 1867 Т. — частка Каралеўства Венгрыя у складзе *Аўстра-Венгрыі*. У час распаду Аўстра-Венгрыі пасля яе паражэння ў 1-й сусв. вайне Т. 1.12.1918 далучана да Румыніі, што прызнана *Трыянонскім мірным дагаворам 1920*. Венскім арбітражам 1940 да Венгрыі далучана Паўн. Т., якая паводле *Парыжскіх мірных дагавораў 1947* зноў замацавана за Румыніяй. У 1952—68 на частцы тэр. Т. існавала Венг. аўт. вобласць з цэнтрам у г. Тыргу-Мурэш.

ТРАНСІЛЬВА́НСКАЕ ПЛАТО́ (Podişul Transilvaniei), плато ў Румыніі, паміж Усх. і Паўд. Карпатамі і Зах. Румынскімі гарамі. Выш. 300—900 м. Складзена пераважна з пясчанікаў і вапнякоў. Моцна расчлянёныя ўзгоркі і куэставыя ўзвышшы, участкі стэпаў і лесастэпаў. Радовішчы солі, газу. Вырошчванне тытуню, пшаніцы, цукр. буракоў.

ТРАНСКАНА́ДСКАЯ МАГІСТРА́ЛЬ, шыротная 2-калейная чыг. магістраль у Канадзе: Прынс-Руперт—Эдмантан—Рэджайна—Вініпег—Атава—Манрэаль—Квебек. Даўж. 4900 км. Злучае парты Ціхага і Атлантычнага акіянаў.

ТРАНСКРЫ́ПЦЫЯ (ад лац. transcriptio перапісванне) у генетыцы, біясінтэз малекул *рыбануклеінавай кіслаты* (РНК) на адпаведных участках *дэзоксірыбануклеінавай кіслаты* (ДНК); першы этап рэалізацыі генет. інфармацыі ў жывых клетках. Фермент ДНК залежная РНК-палімераза далучаецца да знака пачатку Т. (участак ДНК), расплятае падвойную спіраль ДНК і капіруе адзін з яе ланцугоў. Рухаючыся ўздоўж ДНК, фермент паслядоўна далучае манамерныя звёны (*нуклеатыды*) да РНК, што ўтвараецца, у адпаведнасці з прынцы-

пам камплементарнасці. Па меры руху РНК-палімеразы ланцуг РНК адыходзіць ад матрыцы і падвойная спіраль ДНК ззаду фермента ўзнаўляецца. Калі РНК-палімераза даходзіць да канца ўчастка, што капіруецца, РНК аддзяляецца ад матрыцы. Колькасць копій розных участкаў ДНК мяняецца ў ходзе развіцця арганізма. У пухлінародных вірусаў магчымы перанос інфармацыі з РНК на ДНК (адваротная Т.) з дапамогай ферменту адваротнай транскрыптазы (рэвертазы). *Р.Г.Заяц.*

ТРАНСКРЫ́ПЦЫЯ ў м о в а з н а ў с т в е, умоўны від пісьма, які выкарыстоўваецца ў спец. навук. і інш. мэтах. Адрозніваюць фанетычную, фанематычную і практычную Т. Мэта ф а н е т ы ч н а й Т. — найб. дакладна перадаць вымаўленне слова, апісаць асобна кожны вымаўлены гук. У бел. мове для гэтага ўжываюцца літары бел. алфавіта і дадатковыя знакі: «між бяроз — (м'іж б'яро́с)», «снег — (с'н'е́х)», «Янка — (ја́нка)». Значком ' абазначаецца мяккасць папярэдняга зычнага гука, лац. літарай j — гук «[й]» у пазіцыі перад галоснымі. Ф а н е м а т ы ч н а я Т. перадае фанемны (гл. *Фанема*) склад слова: адлюстроўвае не ўсе асаблівасці маўлення, а толькі тыя рысы, якім уласціва адметная функцыя. Параўн.: «<м'іж б'ароз>», «<сн'ег>», «<јанка>». Фанетычная і фанематычная Т. адрозніваюцца ад арфаграфічнага напісання, якое ў значнай ступені абумоўлена гіст. традыцыяй. Пры дапамозе п р а к т ы ч н а й Т. (сродкамі нац. алфавіта) уводзяць у тэкст іншамоўныя ўласныя імёны: асабовыя імёны, геагр. назвы: Шолахаў (рус. Шолохов), Міцкевіч (польск. Mickiewicz). Практычная Т. ўжываецца ў нац. картаграфіі, перыяд. друку, падручніках, шырока выкарыстоўваецца ў творах маст. л-ры.

Літ.: Р е ф о р м а т с к и й А.А. Введение в языковедение. 4 изд. М., 1967.

А.А.Лукашанец.

ТРАНСКРЫ́ПЦЫЯ ў м у з ы ц ы, пералажэнне муз. твора (аранжыроўка) для іншага, чым гэта прадугледжана арыгіналам, інструмента, голасу, выканальніцкага складу; вольная віртуозная апрацоўка твора. Адыгрывае важную ролю ў станаўленні і развіцці інстр. музыкі нац. культур.

Т. з'явілася ў 16—17 ст. як пералажэнне нотных тэкстаў для выканання на інш. інструментах. Росквіт Т. ў 18 ст. звязаны з творчасцю І.С.Баха (клавірныя Т. канцэртаў А.Вівальдзі), у 19 ст. — Ф.Ліста (канцэртныя Т. для фп. 9 сімфоній Л.Бетховена, песень Ф.Шуберта, урыўкаў з опер В.А.Моцарта, Дж.Вердзі). Істотнае развіццё набыла аркестравая Т., стваральнікі якой звычайна ўносілі ў яе ўласны творчы элемент (Моцарт перааркестраваў оперы Г.Ф.Гендэля, Г.Берліёза— К.В.Глюка, М.Рымскі-Корсакаў і Дз. Шастаковіч — М.Мусаргскага).

Сярод бел. кампазітараў і музыкантаў-выканаўцаў да Т. звярталіся А.Клумаў (фп. сюіта на тэмы з балета «Гаянэ» А.Хачатурана), Я.Глебаў (пералажэнні для скрыпкі і фп., кларнета і фп. фрагментаў з уласных балетаў і сімфоній), Дз.Камінскі (творы Г.Вагнера, Б.Сметаны, І.Стравінскага), І.Алоўнікаў (фп. Т. на тэмы з балетаў Глебава, Г.Вагнера) і інш. *І.Дз.Назіна.*

ТРАНСЛАКА́ЦЫЯ (ад *транс...* + лац. locatio размяшчэнне), тып храмасомнай перабудовы (*мутацыі*), пры якім адбываецца перанос участка храмасомы ў новае (незвычайнае) становішча ў той жа або другой храмасоме. Аснова Т. — абмен негамалагічнымі ўчасткамі храмасом (незакончаная *рэкамбінацыя*). Грубыя Т. прыводзяць да зніжэння жыццяздольнасці клеткі і ўсяго арганізма. Выяўляюцца цытагенет. метадамі.

Р.Г.Заяц.

ТРАНСЛЕЙТА́НІЯ (Transleithanien), неафіцыйная назва тэр. на У ад р. Лейта, якая складала венг. частку *Аўстра-Венгрыі* (1867—1918). Уключала, акрамя ўласна Венгрыі, Харватыю, Славонію, Славакію, Трансільванію, Закарпацкую Украіну, Ваяводзіну, порт Рыека (Фіуме), якія таксама ўваходзілі ў склад Каралеўства венграў.

ТРАНСЛЯ́ТАР (ад лац. translator пераносчык) у і н ф а р м а т ы ц ы, праграма ЭВМ для перакладу (трансляцыі) праграм з зыходнай *мовы праграмавання* ў інш. (аб'ектную), напр., *машынную мову*. Бываюць 1-, 2- і шматпраходныя (праз трансліраваную праграму).

Трансляцыя праграм з дапамогай Т.-і н т э р п р э т а т а р а суправаджаецца выкананнем зыходнага алгарытму. Т.-к а м п і л я т а р ажыццяўляе трансляцыю з машынна-незалежнай мовы праграмавання высокага ўзроўню на машынную мову (ці мову асэмблера); Т.-к а н в е р т а р — з зыходнай мовы высокага ўзроўню на аб'ектыўную мову высокага ўзроўню. Асн. функцыі Т. — аналіз (лексічны, сінтаксічны і семантычны) з кантролем тэксту зыходнай праграмы і сінтэз (генерацыя) аб'ектнай праграмы. У 1-праходных Т. яго функцыі выконваюцца за 1 прагляд тэксту праграмы. У 2-праходных — сінтаксічны аналізатар распазнае канструкцыі мовы і будуе адпаведныя элементы ўнутр. прадстаўлення, пасля чаго будуецца аб'ектная праграма. Шматпраходныя Т. будуюць больш эфектыўныя (па памерах, скорасці выканання ці па аб'ёме выкарыстанай памяці) аб'ектныя праграмы, а таксама выкарыстоўваюцца для аптымізацыі праграм для розных тыпаў ЭВМ. Такія Т. патрабуюцца і для некаторых моў праграмавання з-за складанасці сінтаксічнага і семантычнага аналізаў.

Літ.: Г р и с Д. Конструирование компиляторов для цифровых вычислительных машин: Пер. с англ. М., 1975; К а с ь я н о в В.Н., П о т т о с и н И.В. Методы построения трансляторов. Новосибирск, 1986; А х о А., С е т и Р., У л ь м а н Дж. Компиляторы: Пер. с англ. М. и др., 2001. *М.В.Шкут.*

ТРАНСЛЯ́ЦЫЯ (ад лац. translatio перадача), 1) правядзенне пазастудыйных радыё- і тэлевізійных перадач з месца падзей (стадыёнаў, канцэртных залаў, тэатраў і інш.), а таксама перадача мясц. радыё- ці тэлевізійнай станцыяй праграм, атрыманых па каналах сувязі з інш. гарадоў. 2) Працэс прыёму эл. сігналаў і наступнай іх перадачы ў напрамку ад крыніцы да прыёмніка, што ажыццяўляецца на прамежкавых пунктах, напр., радыёрэлейнай сувязі. 3) Бытавая назва праваднога вяшчання. 4) Працэс пераўтварэння праграмы ЭВМ з *мовы праграмавання* ў праграму на аб'ектнай, напр., *машыннай мове* з дапамогай *транслятара*. 5) Перанос матэм. ці фіз. аб'екта паралельна самому сабе ў прасторы на некаторую адлегласць уздоўж прамой (восі Т.). Калі ў выніку Т. аб'ект супадае сам з сабой, то Т. з'яўляецца аперацыяй сіметрыі (гл. *Сіметрыя крышталёў*).

ТРАНСЛЯ́ЦЫЯ ў г е н е т ы ц ы, сінтэз поліпептыдных ланцугоў бялкоў па матрыцы інфармацыйнай *рыбануклеінавай кіслаты* (іРНК) у адпаведнасці з генет. кодам; другі этап рэалізацыі генет. інфармацыі ў жывых клетках. У працэсе Т. інфармацыя пра спецыфічную будову будучага бялку, запісаная ў выглядзе паслядоўнасці нуклеатыдаў у малекулах іРНК, пераводзіцца з нуклеатыднага кода ў пэўную паслядоўнасць амінакіслот у сінтэзуемых бялках. Адбываецца з дапамогай макрамалекулярнага комплексу, які складаецца (акрамя іРНК) з *рыбасом*, транспартных РНК (тРНК), аміна-ацыл-тРНК-сінтэтаз, бялковых фактараў пачатку (ініцыяцыі), падаўжэння, ці нарошчвання, поліпептыду (элангацыі), заканчэння (тэрмінацыі) і інш. Акрамя клетачных іРНК іх ролю ў працэсе Т. часам выконваюць вірусныя РНК, а таксама сінт. полінуклеатыды, якія выкарыстоўваюцца для вывучэння механізма біясінтэзу бялку. Гл. таксама *Транскрыпцыя* ў генетыцы. *Р.Г.Заяц.*

ТРАНСМА́ГРЫБСКАЯ МАГІСТРА́ЛЬ, шыротная 2-калейная чыг. магістраль: Маракеш—Уджда (Марока)—Сіды-Бель-Абес—Скікда (Алжыр)—Туніс—Габес (Туніс). Даўж. 1,9 тыс. км. Праходзіць уздоўж узбярэжжа Міжземнага м. Злучае парты краін Магрыба: Касабланка, Аран, Алжыр, Анаба, Туніс. Пабудавана ў 1920—30-я г.

ТРАНСМЕТЫЛА́ЗЫ, ферменты, тое, што *метылтрансферазы*.

ТРАНСМЕТЫЛІ́РАВАННЕ, ферментатыўная рэакцыя, тое, што *пераметыліраванне*.

ТРАНСМІСІ́ЙНАЕ МА́СЛА, нафтавае ці сінт. *змазачнае масла* для закрытых зубчастых перадач (*рэдуктараў*) усіх відаў.

Вырабляюць на аснове *нафтавага масла* (звычайна сумесі высакавязкіх экстрактаў ад селекцыйнай очысткі астаткавых масел з малавязкімі дыстылятамі) ці *сінтэтычнага масла* з дабаўленнем *прысадак* — процізадзірных (0,5—5% па масе), процізносных (1—3%), антыакісляльных (0,2—3%), проціпенных і інш.

Разнавіднасць Т.м. — гіпоідныя масла (для змазкі *гіпоідных перадач*), якое мае прысадкі, што хімічна ўзаемадзейнічаюць з матэрыялам і ўтвараюць злучэнні, якія выконваюць функцыю процізадзірных пакрыццяў. Адкрытыя зубчастыя перадачы змазваюць асабліва вязкімі астаткавымі нафтавымі масламі з прысадкамі.

ТРАНСМІСІЎНЫЯ ХВАРО́БЫ (ад лац. transmissio пераход, перадача), інфекцыйныя хваробы чалавека, с.-г. і дзікіх жывёл, перадача ўзбуджальнікаў якіх адбываецца пры ўдзеле крывасосных членістаногіх. Пераносчыкі Т.х. — вошы, блохі, кляшчы, клапы, камары і інш. Узбуджальнікі: вірусы, бактэрыі, прасцейшыя. Налічваецца больш за 200 Т.х., у т.л. *малярыя, тулярэмія, чума, сонная хвароба*, эпідэмічны *сыпны тыф* і інш. Большасць Т.х. — прыродна-ачаговыя, сезонныя. Сярод іх вылучаюць *антрапазаанозы, заанозы*. Для чалавека і жывёл падзяляюцца на аблігатна-трансмісіўныя (узбуджальнікі перадаюцца толькі пераносчыкамі, напр., малярыя, *інфекцыйная анемія коней*) і факультатыўна-трансмісіўныя (узбуджальнікі перадаюцца пераносчыкамі і праз ежу, паветра, ваду, напр., *сібірская язва*, тулярэмія). *І.М.Семяненя.*

ТРАНСМІ́СІЯ (ад лац. transmissio пераход, перадача), механізм, які перадае мех. энергію (рух) ад рухавіка да выканаўчага органа машыны або да інш. рабочых машын. Т. наз. таксама сукупнасць *сілавых перадач* у аўтамабілях, трактарах і інш. самаходных машынах.

ТРАНСМІ́ТЭР (англ. transmitter ад лац. transmitto перасылаю, перадаю), перадавальнае тэлегр. прыстасаванне, у якім кодавыя камбінацыі знакаў тэксту тэлеграм, запісаныя ў выглядзе камбінацый адтулін на перфарыраванай стужцы, пераўтвараюцца ў імпульсы эл. току, што паступаюць у лінію сувязі. Выконваецца як дадатковы блок *тэлеграфнага апарата* ці як самастойны перадатчык. Таксама Т. наз. перадатчык у сістэмах тэлекіравання і тэлесігналізацыі на чыгунцы, які перадае кадзіраваныя эл. сігналы ў рэйкавы ланцуг.

ТРАНСНАЦЫЯНА́ЛЬНЫЯ БА́НКІ, буйныя крэдытна-фінансавыя комплексы універсальнага тыпу. Распараджаюцца, як правіла, шырокай сеткай замежных прадпрыемстваў і сістэмай удзелу, у выніку чаго кантралююць пры падтрымцы дзяржавы валютныя і крэдытныя аперацыі на сусв. рынку. Гал. пасрэднікі ў міжнар. руху *пазыковага капіталу*. Гл. *Банк*.

ТРАНСПАЗІ́ЦЫЯ (ад позналац. transpositio перастаноўка) у матэматыцы, камбінаторная перастаноўка элементаў, пры якой мяняюцца месцамі толькі 2 элементы. Напр., 5401 пераходзіць у 5104 Т. элементаў 1 і 4.

ТРАНСПАЗІ́ЦЫЯ ў мовазнаўстве, ужыванне адной моўнай адзінкі ў функцыі іншай. Віды Т. вылучаюцца ў залежнасці ад таго, якія формы транспануюцца: марфалагічная Т. («Іду я ўчора дадому...» замест «Ішоў я ўчора дадому...» — катэгарыяльная Т. часу дзеяслова); сінтаксічную Т. («Ён не мог гэтага зрабіць. Сумленне не дазваляла.» — «Ён не мог гэтага зрабіць, бо сумленне не дазваляла.» — Т. незалежнага сказа ў сказ залежны); лексіка-семантычная Т. («Зялянее ліпа.» — «Усе гэтыя паперы — ліпа.»); словаўтваральная Т. («стары дзед» — «стары», субстантывацыя; «адзін, два, тры...» — «Адзін мядзведзь ішоў па лесе...» пранаміналізацыя; «Дастаткова аднаго разу, каб...» — «Аднаго разу ён вяртаўся дадому», адвербіялізацыя; «пабіты гаспадаром сабака» — «пабіты выгляд», ад'ектывацыя) і інш. Т. пашырае намінатыўныя магчымасці мовы, узбагачае сінанімічныя здольнасці моўных адзінак, служыць сродкам утварэння функцыянальных *сінонімаў*. *А.Я.Міхневіч.*

ТРАНСПАЗІ́ЦЫЯ ў музыцы, разнавіднасць адаптацыі муз. твора (вак., хар., інстр.) спосабам адэкватнага яго перанясення ў інш. *танальнасць* з мэтай выбару зручнай тэсітуры ці дыяпазону для выканаўцы. У выніку Т. адбываюцца гукавышынныя змены муз. матэрыялу (ноты, гукі) на любы інтэрвал (акрамя актавы) уверх або ўніз адносна асн. танальнасці арыгінала. Можа быць Т. партыі якога-н. інструмента (гл. *Транспануючыя музычныя інструменты*). Т. дазваляе пашырыць рэпертуар у вак., харавой, інстр. музыцы за кошт адаптацыі твораў, напісаных для інш. відаў і жанраў муз. мастацтва. З Т. цесна звязаны паняцці інструментазнаўства, *інструментоўка, транскрыпцыя*. *А.Л.Карацееў.*

ТРАНСПАНАВА́НАЯ МА́ТРЫЦА, адна з *матрыц* $\|a'_{ik}\|$, атрыманая з зададзенай прамавугольнай ці (квадратнай) матрыцы $\|a_{ik}\|$ заменай радкоў на слупкі (элементы $a'_{ik} = a'_{ki}$). Колькасць радкоў Т.м. роўная колькасці слупкоў зыходнай матрыцы і наадварот.

ТРАНСПАНУ́ЮЧЫЯ МУЗЫ́ЧНЫЯ ІНСТРУМЕ́НТЫ (ад лац. transponere перакладваць, перастаўляць), музычныя інструменты, рэальная вышыня гучання якіх не адпавядае іх натацыі. Пераважна духавыя інструменты: лабіяльныя і язычковыя (разнавіднасці флейты, габоя, кларнета, фагота, саксафона і інш.) і амбушурныя (валторна, труба, карнет і інш.), а таксама ўмоўна інструменты, гучанне якіх на актаву вышэй (флейта пікала) ці ніжэй (кантрабас, контрафагот). Паводле тэсітуры гучання Т.м.і.: сапранавыя (флейта пікала; кларнеты; саксафоны, трубы, фанфары; флюгельгорн); альтовыя (флейта; габой, саксафон, валторна, горн); тэнаровыя (саксафон, горн); барытонавыя (саксафон; горн, эйфоніум); басовыя (кларнет; саксафон). Т.м.і. даюць магчымасць выконваць музыку ў любых танальнасцях, пры захаванні зручнай аплікатуры і без змены тэхнікі гуказдабывання для інструментаў вызначанай сям'і, пры гэтым спрошчваецца нотны запіс.

Літ.: Левин С. Духовые инструменты в истории музыкальной культуры. Ч. 1—2. Л., 1973—83. *А.Л.Карацееў.*

ТРА́НСПАРТ (ад лац. transporto пераношу, перамяшчаю, перавожу), галіна вытв-сці, якая ажыццяўляе перавозкі грузаў і пасажыраў. Адрозніваюць Т. наземны (*аўтамабільны транспарт, трубаправодны транспарт, чыгуначны транспарт*), водны (*марскі транспарт, рачны транспарт*), *паветраны транспарт* (гл. таксама *Грамадзянская авіяцыя*). Падзяляецца на Т. агульнага карыстання, які абслугоўвае галіны эканомікі і насельніцтва, і неагульнага карыстання — ведамасны Т., *прамысловы транспарт*. Адрозніваюць Т. пасажырскі, грузавы (гл. *Грузавыя перавозкі*), асабістага карыстання (легкавыя аўтамабілі, матацыклы, веласіпеды, лодкі, яхты і інш.).

Прымітыўнымі сродкамі Т. (павозкі, веславыя судны, уючныя жывёліны і інш.) карысталіся яшчэ ў стараж. часы. Т. агульнага карыстання вылучыўся ў асобную галіну вытв-сці ў перыяд прамысл. перавароту ў Зах. Еўропе (1860-я г.). Да сярэдзіны 19 ст. чыг. лініі агульнага карыстання будаваліся ва ўсіх краінах Еўропы і ў ЗША. У пач. 20 ст. сусв. чыг. сетка складала больш за 1100 тыс. км. Хутка развівалася марское і рачное суднаходства, аўтамаб. Т., у 1920-я г. з'явіўся паветраны Т.

На Беларусі першая чыгунка, якая злучыла Парэчча з Гродна (участак дарогі Пецярбург—Варшава) здадзена ў 1862, у 1866 пачаўся рух на ўчастку Бігосава—Віцебск (Дынабургска-Віцебская чыгунка), у 1874 — Вілейка—Гомель (Лібава-Роменская чыгунка) і інш. У 1913 працягласць чыгункі складала 3,8 тыс. км, аўтамаб. дарог — 3,5 тыс. км. Першая транспартная авіялінія Мінск—Глуск—Парычы—Мазыр пачала дзейнічаць у 1933. Развіццё трубаправоднага Т. пачалося з 1960, калі ўведзены ў дзеянне газаправод Дашава—Мінск. У 2001 трансп. сістэма Беларусі складалася з 5533 км чыг. ліній агульнага карыстання, у т.л. 894 км электрыфікаваных, 74,4 тыс. км аўтамаб. дарог (66, 3 тыс. км з цвёрдым пакрыццём), 99,1 км трамвайных, 466,6 км тралейбусных, 23,7 км метрапалітэнных ліній, 6,7 тыс. км магістральных газаправодаў, 2,9 тыс. км нафтаправодаў, 1,2 тыс. нафтапрадуктаправодаў, сотні тэхнічна аснашчаных чыг. станцый, аўтавакзалаў і інш. У структуры валавога ўнутр. прадукту на Т. прыпадала 9,5% (асн. паказчыкі развіцця транспарту агульнага карыстання Беларусі гл. ў табл.). Гл. таксама раздзел Транспарт у арт. *Беларусь*.

ТРА́НСПАРТ РЭ́ЧЫВАЎ у жывых арганізмах, перанос рэчываў у вадкіх асяроддзях арганізма (кроў, лімфа, тканкавая вадкасць) і праходжанне іх праз біял. бар'еры (мембраны, клеткі, міжклетачны матрыкс). У біял. вадкасцях рэчывы транспартуюцца ў свабодным або звязаным (пераважна з бялкамі) выглядзе. Пры пераходзе праз мембраны адрозніваюць Т.р. пасіўны і актыўны. Пасіўны ажыццяўляецца па градыенце канцэнтрацыі (ад большай да меншай) у бок меншага электрахім. патэнцыялу без затраты метабалічнай энергіі (гідролізу АТФ), уключае *дыфу-*

Грузавыя і пасажырскія перавозкі асобнымі відамі транспарту Беларусі

Від транспарту	1985	1990	1995	2001
Грузаабарот, млн. ткм				
Чыгуначны	73 243	75 430	25 510	29 726,5
Аўтамабільны	17 737	22 361	9 539	8 712,6
Рачны	2 242	1 805	133	*—
Паветраны	44	38	60	28,4
Трубаправодны	*—	—	—	53 864,1
Пасажыраабарот, млн. пасажыра-км				
Чыгуначны	13 761	16 852	12 505	15 263,9
Аўтамабільны (аўтобусны)	16 349	19 787	9 308	9 493,4
Рачны	46	30	2	1,9
Паветраны	3 311	5 510	1 228	546,2
Тралейбусны	*—	—	1 723	2 651,6
Трамвайны	*—	—	407	543,3
Метрапалітэнны	*—	—	688	1 775,3

* звесткі не публікаваліся

зію (простую і аблегчаную) і перанос праз каналы. Простая дыфузія (напр., кісларoду O_2, дыаксіду вуглярoду CO_2) ажыццяўляецца без утварэння комплексаў з інш. малекуламі; аблегчаная — з дапамогай рухомых або фіксаваных у мембранах пераносчыкаў (напр., усмоктванне ў кішэчніку вітаміну B_{12} з дапамогай спец. трансп. бялку — гастрамукапратэіну). Т.р. праз спецыялізаваныя каналы характэрны для іонаў натрыю Na^+, калію K^+, кальцыю Ca^{2+} і інш. Актыўны Т.р. адбываецца супраць градыентаў іх хім. канцэнтрацый з затратай метабалічнай энергіі (гідроліз АТФ). Так ажыццяўляецца перанос нізкамалекулярных катыёнаў, амінакіслот, некат. гармонаў, вітамінаў і інш. Асобныя віды Т.р. — *осмас, пінацытоз, фільтрацыя.* *І.М.Семяненя.*

ТРА́НСПАРТНА-АДВА́ЛЬНЫ МОСТ, самаходны агрэгат неперарыўнага дзеяння, якім мяккія раскрыўныя пароды, вынятыя пры адкрытай распрацоўцы радовішчаў, перамяшчаюць ва ўнутр. адвал. Дзейнічае сумесна з ротарным або многакаўшовым экскаватарам.

ТРА́НСПАРТНАЕ БУДАЎНІ́ЦТВА, галіна *будаўніцтва*, якая ажыццяўляе будаванне і рэканструкцыю аб'ектаў чыг., аўтамаб., воднага, паветр., трубаправоднага *транспарту*; уключае буд-ва земляных палотнаў чыгунак і аўтадарог, верхняй будовы дарог, пуцеправодаў, установак электрыфікацыі, аўтаматыкі і тэлемеханікі чыгункі, дарожных і аэрадромных пакрыццяў, мастоў, тунэляў і метрапалітэнаў, прычалаў рачных партоў, каналаў, магістральных нафта- і газаправодаў, вакзалаў, дэпо, службова-тэхн. і інш. трансп. будынкаў.

На Беларусі вядзецца з канца 18 — пач. 19 ст., калі былі пабудаваны *Агінскі канал* (1783), *Бярэзінская водная сістэма* (1805), *Аўгустоўскі канал* (1839), *Дняпроўска-Бугскі канал* (1848). Да 1913 пракладзена значная працягласць чыг. і гужавых дарог, будаваліся вакзалы, рачныя прычалы. Працягласць чыгункі ў 1913 складала 3,81 тыс. км, у т.л. чыг. магістралі Смаленск—Мінск—Брэст (1871), Бранск—Брэст (1887), Роўна—Вільня (1885) і інш. Пабудаваны вакзалы: Віленскі ў Мінску (1874), Віцебскі і Гродзенскі (1866—67), Брэсцкі (1886) і інш. Працягласць аўтадарог да 1913 складала 3,5 тыс. км. Да Вял. Айч. вайны ў БССР пабудавана больш як 1000 км чыг. ліній, у т.л. Асіповічы—Магілёў—Крычаў—Шасцёраўка—Орша—Лепель, Навабеліца—Чарнігаў; рэканструяваны чыг. вузлы: Орша, Віцебск, Полацк, Гомель, Жлобін і інш., а таксама Баранавічы і Ліда. У 1939—40 перабудаваны чыг. лініі зах. абласцей на адзіную ў СССР каляю. Будаваліся новыя чыг. вакзалы, дэпо, Гомельскі рачны порт, Сожская шлюзавая сістэма ў г. Крычаў, прыстані ў Жлобіне (на Дняпры), Пхове (на Прыпяці), Чэпіне (на Зах. Дзвіне) і інш. У 1933 адкрыты Мінскі аэравакзал. У 1930-я г. пабудаваны шашэйныя дарогі працягласцю 1236 км, у т.л. Мінск—Магілёў і Мінск—Орша. У Вял. Айч. вайну на тэр. Беларусі разбурана больш за 2 тыс. км чыг. ліній, большасць чыг. і аўтамаб. масцоў, 50% чыг. вакзалаў і г.д. У пасляваен. гады старыя трансп. аб'екты адноўлены і рэканструяваны, пабудавана шмат новых вакзалаў, у т.л. ў Баранавічах (1947), Гродне і Гомелі (1948), Оршы (1951), Полацку (1953), Брэсце (1956) і інш. Сучасная (2001) сетка чыг. ліній Рэспублікі Беларусь складае 5,5 тыс. км, у т.л. 894 км электрыфікаваных. Першы электрыфікаваны ўчастак чыгункі Мінск—Аляхновічы дзейнічае з 1963. У 1989 электрыфікавана ўся лінія Брэст—Масква. У 2000 уведзена першая чарга новага будынка вакзала станцыі Мінск-Пасажырскі. На 1.1.2001 працягласць аўтадарог агульнага карыстання складала 74,4 тыс. км, у т.л. 66,2 тыс. км з цвёрдым пакрыццём. На дарогах пабудавана 4245 мастоў і пуцеправодаў агульнай працягласцю больш за 160 км. Самы доўгі мост на Беларусі (929 м) пабудаваны ў 1991 цераз Прыпяць каля Мазыра. У 2002 заканчваецца рэканструкцыя шасціпалоснай Мінскай кальцавой аўтамаб. дарогі (56,4 км), на якой пабудаваны 34 масты і пуцеправоды агульнай працягласцю больш за 2 км. Па тэр. Беларусі праходзяць *аўтамагістралі* міжнар. значэння: Масква—Брэст, С.-Пецярбург—Адэса, Мінск—Вільнюс і інш. Пабудавана больш за 100 аўтастанцый, каля 40 аўтавакзалаў, у т.л. буйнейшыя — *Мінскі аўтавакзал «Усходні»* (1983) і *Мінскі аўтавакзал «Маскоўскі»* (1999). Пабудаваны аэравакзалы ў Гродне (1962), Салігорску (1965), Бабруйску (1966), Магілёве (1971), Гомелі (1976) і інш. Нацыянальны аэрапорт Мінск (1-я чарга ў 1993) і Брэсцкі аэравакзал (1986) адпавядаюць стандартам міжнар. класа. У 1984 здадзены ў эксплуатацыю першы ўчастак 1-й лініі Мінскага метрапалітэна. На 1.1.2002 працягласць дзвюх ліній метрапалітэна складае 23,7 км. На іх размешчаны 20 станцый і адзін перасадачны вузел. З 1960 на Беларусі развіваецца *трубаправодны транспарт*. На 1.1.2001 агульная працягласць магістральных газа-, нафта- і прадуктаправодаў складае больш за 10 тыс. км. Адначасова з буд-вам трубаправодаў будаваліся *кампрэсарныя станцыі, газаразмеркавальныя станцыі, газарэгулятарныя пункты, нафтаперапампавачныя станцыі* і інш. *І.І.Леановіч.*

ТРА́НСПАРТНАЕ МАШЫНАБУДАВА́ННЕ, галіны машынабудавання, якія выпускаюць сродкі аўтамаб., паветранага, воднага і чыг. транспарту. Гл. ў арт. *Аўтамабільная прамысловасць, Авіяцыйная прамысловасць, Суднабудаванне, Чыгуначнае машынабудаванне.*

ТРА́НСПАРТНАЯ РАЗВЯ́ЗКА, інжынернае збудаванне (або комплекс збудаванняў) на перасячэнні дарог, якое забяспечвае бесперабойны рух трансп.



Транспартна-адвальны мост: 1 — адвальная кансоль; 2 — стужачны канвеер; 3 — пралётная частка; 4, 5 — экскаватарная і адвальная апоры.

патокаў у розных напрамках. Робіцца ў 2 або некалькіх ўзроўнях. Пры перасячэнні дарог у адным узроўні звычайна ў вузле перасячэння робяць кальцавое разгалінаванне.





Транспартныя развязкі: 1 — схема перасячэння па тыпе канюшынавага ліста; 2 — Т-падобны тып прымыкання; 3 — кальцавы тып разгалінавання; 4 — перасячэнне «канюшынавы ліст».

Адрозніваюць Т.р. поўную (забяспечвае неперарыўны рух без перасячэнняў траекторый аўтамабіляў) і няпоўную (на асобных участках планіроўкі развязкі ёсць перасячэнні траекторый у адным узроўні). У сістэму Т.р. ўваходзяць штучныя збудаванні (*пуцеправоды, тунэлі*, насыпы, выемкі і інш.).

На Беларусі найб. пашырэнне набылі Т.р. пры перасячэнні 2 напрамкаў дарог у розных узроўнях у выглядзе канюшынавага ліста. *С.В.Багдановіч.*

ТРА́НСПАРТНЫ КАРАБЕ́ЛЬ касмічны, апарат для дастаўкі экіпажа і грузу на *арбітальную станцыю* і вяртання іх на Зямлю, вывядзення *касмічных апаратаў* на калязямныя арбіты. Адрозніваюць Т.к. пілатуемыя («*Саюз*» і яго мадыфікацыі) і аўтаматычныя («*Прагрэс*» і яго мадыфікацыі); аднаразовыя («Саюз», «*Апалон*») і шматразовыя («*Спейс шатл*»).

Мае рухальную ўстаноўку для манеўраў у космасе, сістэмы і сродкі для збліжэння, стыкоўкі і пераходу касманаўтаў на борт арбітальнай станцыі, у шэрагу выпадкаў — абсталяванне для работы касманаўтаў у адкрытым космасе. Т.к. «Саюз ТМ(А)» выконвае таксама ролю карабля-выратавальніка для экіпажа Міжнар. касм. станцыі. Т.к. з'яўляецца таксама месяцавая кабіна, якая выкарыстоўвалася амер. касманаўтамі для высадкі на Месяц і вяртання экіпажа на касм. карабель «Апалон». *У.С.Ларыёнаў.*

ТРА́НСПАРТНЫ КО́МПЛЕКС, сукупнасць прапарцыянальна развітых галін нар. гаспадаркі, якія задавальняюць патрэбы грамадскай вытв-сці ў перамяшчэнні грузаў і пасажыраў. Забяспечвае прасторавыя сувязі паміж вытв-сцю і спажываннем, прам-сцю і сельскай гаспадаркай, прыродна-гасп. раёнамі, краінамі. Уключае галіны *транспартнага машынабудавання, транспартнага будаўніцтва*, трансп. паліўна-энергет. прадпрыемствы, органы планавання і кіравання транспартам і трансп. галіны (чыгуначны, марскі, авіяц., аўтамаб., рачны, трубаправодны транспарт; гл. адпаведныя арт.), *прамысловы транспарт*, гар., ведамасны транспарт, а таксама новыя віды транспарту — на магнітным падвешванні, на паветр. падушцы і інш. Тэхн. аснову Т.к. складаюць сродкі вытв-сці трансп. машынабудавання і буд-ва, трансп. магістралі і сетка дарог, будынкі і збудаванні, а таксама машыны, якія выконваюць трансп. функцыі, у тл. па перавозках грузаў і пасажыраў, сродкі пагрузкі і выгрузкі, складавання і перавалкі грузаў на ўсіх відах транспарту, у прам-сці, сельскай гаспадарцы і інш. галінах, сувязь і сродкі кіравання транспартам, трансп. вузлы. Эфектыўнасць работы прадпрыемстваў і арг-цый Т.к. ў значнай меры залежыць ад скаардынаванай дзейнасці ўсіх галін трансп. сістэмы. На Беларусі кіраванне Т.к. ажыццяўляе ўрад краіны, якому падпарадкаваны Мін-ва транспарту і камунікацый, *Беларуская чыгунка*, Дзярж. канцэрн па нафце і хіміі, прадпрыемства «Белтрансгаз» і інш.

ТРА́НСПАРТНЫЯ ВЫДА́ТКІ, выражаныя ў грашовай форме затраты на перавозку грузаў (сыравіны, матэрыялаў, паліва, гатовай прадукцыі і інш.) ад месца іх вытв-сці да месца спажывання; улічваюцца як транспартная складальная ў цане тавару. Залежыць ад аб'ёму грузаў і далёкасці іх перавозкі, велічыні тарыфаў, узроўню механізацыі пагрузачна-разгрузачных работ. Фактары зніжэння Т.в.: рацыянальнае размяшчэнне прадпрыемстваў, набліжэнне іх да крыніц сыравіны і раёнаў спажывання прадукцыі, камбінаванне вытв-сці і ўстараненне сустрэчных перавозак, ужыванне кантэйнераў, паляпшэнне выкарыстання рухомага саставу і інш. Гл. таксама *Выдаткі вытворчасці*.

ТРА́НСПАРТНЫЯ МАШЫ́НЫ, машыны для перавозкі (перамяшчэння, транспартавання) грузаў і пасажыраў. Бываюць аўтадарожныя, чыгуначныя, паветраныя, водныя, гарадскія, пад'ёмна-транспартныя.

Аўтадарожныя Т.м.: *аўтамабілі* пасажырскія (*аўтобусы, легкавыя аўтамабілі*), *грузавыя аўтамабілі* (у т.л. *аўтапаязды*), спецыялізаваныя (*бензавозы, бетанавозы, бітумавозы, кантэйнераво́зы, рэфрыжэратары, самазвалы, седлавыя цягачы* і інш.), для цяжкіх дарожных умоў (*«амфібіі», усюдыходы*), для вайсковых патрэб (*баявыя машыны пяхоты, бронеаўтамабілі, бронетранспарцёры*). Чыгуначныя: *лакаматывы* з *вагонамі*, у т.л. *паравозы, цеплавозы, газатурбавозы, дызель-паязды, матавозы, электравозы, аўтаматрысы, дрызіны*, а таксама пасажырскія, паштова-багажныя, груза-пасажырскія, турысцкія, грузавыя, гаспадарчыя і інш. *цягнікі*. Паветраныя: грузавыя і пасажырскія *самалёты* і *верталёты*, а таксама *вінтакрылы, дырыжаблі, аэрастаты, экранапланы*, паветраныя *шары* і інш. Водныя: грузавыя (наліўныя, сухагрузныя, сухагрузна-наліўныя і кантэйнерныя), пасажырскія і грузапасажырскія *судны*, у т.л. *параходы, цеплаходы, турбаходы, электраходы, атамаходы, судны на паветранай падушцы* і *судны на падводных крылах, паромы, баржы* і інш. Гарадскія: аўтобусы, *тралейбусы, трамваі, метрапалітэн, фунікулёры*, а таксама двухколавыя — *матацыклы, мапеды, веласіпеды*, некаторыя *камунальныя машыны*. *Пад'ёмна-транспартныя машыны*: машыны канатных і манарэйкавых дарог, *канвееры, ліфты, транспарцёры, элеватары, эскалатары* і інш. *пад'ёмнікі*. Гл. таксама *Аўтамабільны транспарт, Гарадскі транспарт, Марскі транспарт, Рачны транспарт, Паветраны транспат, Чыгуначны транспарт*.

ТРА́НСПАРТНЫЯ ПЕРАВО́ЗКІ, паслугі транспартных арг-цый па перавозцы грузаў і пасажыраў. Гл. ў арт. *Перавозкі*.

ТРА́НСПАРТНЫЯ СУ́ДНЫ, рачныя і марскія *судны* для перавозкі (транспартавання) грузаў і пасажыраў. Як грузавыя, пасажырскія і грузапасажырскія Т.с. выкарыстоўваліся грабныя — *вёславыя судны, ветразевыя судны* і *параходы*; выкарыстоўваюцца *цеплаходы, турбаходы, электраходы, атамаходы*. Т.с. — асн. *транспартныя машыны* воднага транспарту (гл. *Рачны транспарт, Марскі транспарт*).

ТРАНСПАРЦЁР (франц. transporteur ад лац. transporto пераношу), тое, што *канвеер*.

ТРАНСПАРЦІ́Р (франц. transporteur ад лац. transporto пераношу), прылада для пабудовы і вымярэння вуглоў на чарця-

жах. Мае выгляд паўкруга, падзеленага на 180 частак (градусаў), цэнтр якога размешчаны на лінейцы з папярочным маштабам. Дакладнасць Т. расце з павелічэннем яго памераў.



Транспарцір.

ТРАНСПІРА́ЦЫЯ (ад *транс...* + лац. spiro дыхаю, выдыхаю), фізіялагічнае выпарэнне вады раслінай. Гал. орган Т. — ліст, што выпарае ваду праз *вусцейкі* (вусцейкавыя Т.), часткова можа адбывацца праз *кутыкулу* (кутыкулярная Т.; яе інтэнсіўнасць у 10—20 разоў ніжэйшая). Інтэнсіўнасць Т. вызначаецца колькасцю вады (у грамах, якая траціцца раслінай на адзінку яе паверхні (1 см^2, 1 м^2), або на 1 г сырой масы за гадзіну. Залежыць ад асветленасці, т-ры і вільготнасці паветра, скорасці ветру, колькасці вады ў расліне. Разам з каранёвым ціскам забяспечвае пастаянны ток вады праз карані, сцёблы і лісце з глебы ў атмасферу, рэгулюе водны і тэмпературны рэжым расліны, прадухіляе перагрэў ліста.

ТРАНСПЛАНТА́ЦЫЯ (позналац. transplantatio ад transplanto перасаджваю), перасадка органаў і тканак, у жывёл і чалавека замяшчэнне пашкоджаных або адсутных органаў ці тканак уласнымі тканкамі і органамі або атрыманымі ад інш. арганізма. Арганізм, ад якога бяруць органы і тканкі (трансплантат), наз. донарам, арганізм, якому іх перасаджваюць — рэцыпіентам. Участак тканкі або орган, які выкарыстоўваюць для Т., можа быць перасаджаны на месца выдаленага органа (ортатапічная Т.) або ў інш. месца (гетэратапічная Т.).

Адрозніваюць аўта- (перасадка ў межах адной асобіны), іза- (перасадка ад генет. ідэнтычных асобін, напр., аднаяйцавых блізнят, кроўных сваякоў), ала- (перасадка ад арганізма таго ж віду) і ксенатрансплантацыю (донар і рэцыпіент розных відаў). Каб папярэдзіць *тканкавую несумяшчальнасць* пры Т., выкарыстоўваюць розныя віды імунадэпрэсіўнай тэрапіі. Адзін са шляхоў пераадолення біял. несумяшчальнасці трансплантата і арганізма рэцыпіента — стварэнне штучных органаў (сэрца, падстраўнікавай залозы і інш.). Робяць Т. нырак (больш за 500 тыс. перасадак у свеце), печані, сэрца, лёгкіх, вілачкавай залозы з грудзінай, шчытападобнай залозы, скуры, мышцаў, сухажылляў, касцявой, храстковай, тлушчавай тканак, сасудаў, нерваў, касцявога мозгу, рагавіцы вока і інш. Пашыраецца Т. клетачных элементаў, эмбрыянальных тканак і інш. У эксперым. анкалогіі робяць Т. пухлін жывёлам.

На Беларусі Т. нырак ажыццяўляецца ў Рэсп. цэнтры нефралогіі і трансплантацыі ныркі (больш за 700 аперацый; 2002); Т. касцявога мозгу — у Рэсп. цэнтры гематалогіі і трансплантацыі касцявога мозгу (з 1994). У раслін Т. — перасадка розных частак расліны на інш. расліну ці на іншае месца той жа расліны. Лепш развіваюцца расліны больш блізкіх сістэматычных груп. Т. выкарыстоўваецца ў садоўніцтве (гл. *Прышчэпліванне*), для даследавання працэсаў зрастання, узаемаадносін прышчэпка і прышчэпы. Бывае таксама натуральная Т. ліся, кветак, пладоў, сцёблаў, каранёў.

Літ.: Мур Ф. История пересадок органов: Пер. с англ. М., 1973; Трансплантология: Руководство. М.; Тула, 1995. *І.М.Семяненя.*

ТРАНССЕКСУАЛІ́ЗМ (ад *транс...* + лац. sexualis палавы), устойлівая неадпаведнасць палавой самасвядомасці чалавека яго сапраўднаму генет. і ганадналу полу. У аснове Т. цяжкія парушэнні ўнутрывантробнага развіцця мазгавых структур, якія адказваюць за палавыя паводзіны, што вядзе да скажэння палавой самасвядомасці. *Палавое выхаванне* не ўплывае на станаўленне палавой самасвядомасці пры выражаных формах Т., але станоўча ўплывае пры карэкцыі яго лёгкіх форм. У час *палавога выспявання* стойкія праявы Т. ўзмацняюцца (непрыманне свайго цела, палавых органаў). Пры выражаных формах Т. часам робяць аперацыі па змене полу. *І.М.Семяненя.*

ТРАНССІБІ́РСКАЯ МАГІСТРА́ЛЬ, Вялікая Сібірская магістраль, найбуйнейшая транскантынент. 2-калейная чыг. магістраль: Масква—Разань—Сызрань—Самара—Чэлябінск—Омск— Новасібірск—Краснаярск—Іркуцк—Чыта—Хабараўск—Уладзівасток. Даўж. 9332 км. Злучае цэнтр. раёны з Сібір'ю і Д. Усходам. Мае адгалінаванні: Улан-Удэ—Наушкі—Улан-Батар (Манголія) і ў Кітай; Борзя—Салаўёўск—Чайбалсан (Манголія) і інш. Пабудавана ў 1895—1916. На значнай адлегласці электрыфікавана.

ТРАНССУДА́Т (ад *транс...* + лац. sudare сачыцца), вадкасць, якая назапашваецца ў тканкавых шчылінах і поласцях цела жывёл і чалавека пры *ацёках* — у выніку парушэння крова- і лімфазвароту.

Бясколерная або бледнавата-жоўтая празрыстая вадкасць, бедная бялком, па саставе солей набліжаецца да *плазмы крыві*. Удз. в. 1006—1020. Утвараецца ў выніку пранікнення сываратак крыві праз сценкі крывяносных капіляраў пры павышэнні іх пранікальнасці (пры недастатковай дзейнасці сэрца, нырак, цырозе печані і інш.). Т. лёгка інфіцыруецца і ператвараецца ў эксудат (гл. *Выпат*).

А.С.Леанцюк.

ТРАНСУРА́НАВЫЯ ЭЛЕМЕ́НТЫ, хімічныя радыеактыўныя элементы, размешчаныя ў *перыядычнай сістэме элементаў Мендзялеева* пасля *урану*. Усе Т.э. сінтэзаваны пры дапамозе *ядзерных рэакцый* (у прыродзе ў мікраколькасці выяўлены *нептуній* і *плутоній*). З павелічэннем зараду ядра *перыяд паўраспаду* Т.э. рэзка памяншаецца — ад $8 \cdot 10^6$ гадоў для плутонію-224 да мілісекунд для элементаў № 106—109.

ТРАНСФАРМА́ТАР (ад лац. transformo пераўтвараю) электрычны, электрычны апарат без рухомых частак для пераўтварэння *пераменнага току* аднаго напружання ў пераменны ток другога напружання пры нязменнай частаце. Дзеянне Т. грунтуецца на з'яве *электрамагнітнай індукцыі*. Існуюць Т. адна- і трохфазныя; сілавыя для перадачы і размеркавання электраэнергіі, спец. сілавыя для электразваркі, выпрамных установак і інш.; *трансфарматары вымяральныя*, высакавольтныя выпрабавальныя, імпульсныя, узгадняльныя, для ператварэння колькасці фаз, частаты, у т.л. радыёчастотныя, і інш. Магутнасць Т. да соцень мегавольтампер, ккдз магутных сілавых Т. 0,98—0,99.

Складаецца з *магнітаправода* з ліставой трансфарматарнай сталі, размешчаных на ім адной першаснай, адной і больш другасных ізаляваных абмотак. Ёсць Т., у якіх першасная і другасная абмоткі маюць агульную частку (*аўтатрансфарматары*). Ток, які пераўтвараецца, падаецца на першасную абмотку, створаны ім пераменны магн. паток наводзіць у другасной абмотцы эрс узаемаіндукцыі. Адносіны першаснага напружання да другаснага роўныя адносінам колькасці віткоў у абмотках і наз. каэф. трансфармацыі. Калі першаснае напружанне большае за другаснае, Т. панізальны, у адваротным выпадку — павышальны. Адпаведныя сілавыя Т. ўстанаўліваюць на павышальных і паніжальных *трансфарматарных падстанцыях*. Для ахаладжэння Т. значнай магутнасці іх магнітаправод і абмоткі ставяць у метал. бак са спец. трансфарматарным маслам, ахаладжэнне Т. невял. магутнасці натуральнае (паветранае). У радыёэлектроннай апаратуры найб. пашыраны герметызаваныя Т., выкарыстоўваюцца таксама Т. ў бяскорпусным выкананні.

На Беларусі Мінскі электратэхн. з-д выпускае Т. сілавыя масляныя магутнасцю да 1000 кВА, сілавыя сухія да 1000 кВА, маламагутныя сухія 0,063—2,5 кВА рознага прызначэння.

У.М.Сацута.



Схема **трансфарматара** электрычнага: 1, 2 — першасная і другасная абмоткі; 3 — асяродак; Φ_0 — асноўны магнітны паток; Φ_1,Φ_2 — патокі рассеяння; I_1, I_2, U_1, U_2 — токі і напружанні ў першаснай і другаснай абмотках; $R_н$ — супраціўленне нагрузкі.

ТРАНСФАРМА́ТАР ВЫМЯРА́ЛЬНЫ, электрычны паніжальны *трансфарматар*, на першасную абмотку якога ўздзейнічаюць ток або напружанне, што вымяраюцца, а да другаснай падключаны электравымяральныя прылады або рэле аховы. Выкарыстоўваецца пераважна ў ланцугах *пераменнага току* высокага напружання для вымярэнняў сілы току, напружання і магутнасці з дапамогай *амперметраў*, *вальтметраў* і *ватметраў*. Адрозніваюць Т.в. напружання і току.

. Трансфарматар напружання пераўтварае высокае эл. напружанне пераменнага току (больш за 380 В) у напружанне, прыдатнае для вымярэнняў стандартнымі прыладамі (звычайна 100 В). Першасная абмотка далучаецца да ланцуга высокага напружання, другасная — да вымяральных прылад і рэле аховы. Выпускаюцца на намінальнае напружанне ад 380 В да 750 кВ. Трансфарматар току пераўтварае пераменны эл. ток вял. сілы да значэння, прыдатнага для вымярэнняў стандартнымі прыладамі. Першасная яго абмотка ўключаецца паслядоўна ў ланцуг току, які вымяраецца, а другасныя — у ланцуг вымяральных прылад і рэле аховы. Выпускаюцца на намінальную сілу першаснага току ад 5 А да 5 кА пры напружанні ад 380 В да 750 кВ (сіла другаснага намінальнага току 5 і 1 А). Т.в. бываюць тэхнічныя для прамысл. установак і лабараторныя. *У.М.Сацута.*

ТРАНСФАРМА́ТАРНАЕ МА́СЛА, гл. ў арт. *Ізаляцыйныя маслы*.

ТРАНСФАРМА́ТАРНАЯ ПАДСТА́НЦЫЯ, электрычная ўстаноўка для павышэння ці паніжэння напружання пераменнага току і размеркавання электраэнергіі паміж спажыўцамі. Складаецца з *трансфарматараў*, *размеркавальных устройстваў*, апаратуры *рэлейнай аховы*, аўтаматычнага кіравання, дапаможнага абсталявання.

Бываюць павышальныя (звычайна на электрастанцыях), на якіх генератарнае (ніжэйшае, да 24 кВ) напружанне пераўтвараецца ў больш высокае (110—750 кВ) для перадачы на далёкую адлегласць па *лініях электраперадачы*, і паніжальныя, на якіх высокае напружанне *электрычнай сеткі* паніжаецца (да 35, 10, 6 і 0,4 кВ) для размеркавання электраэнергіі паміж спажыўцамі. Паніжальныя Т.п. бываюць раённыя (забяспечваюць электраэнергіяй гал. паніжальныя падстанцыі, буйныя прамысл., гарадскія і с.-г. раёны) і мясцовыя (цэхавыя; служаць для электразабеспячэння асобных прадпрыемстваў, цэхаў, раёнаў горада, вёсак і інш.). Т.п. будуюць адкрытыя (па-за будынкам) і закрытыя (у памяшканнях). Шырока выкарыстоўваюцца адкрытыя і закрытыя камплектныя Т.п., у якіх абсталяванне размешчана ў метал. каркасах або шафах; ад іх сілкуюцца невял. прамысловыя і камунальныя прадпрыемствы, грамадскія і адм. будынкі, буд. пляцоўкі, с.-г. спажыўцы.

На Беларусі Мінскі электратэхн. з-д з 1957 выпускае камплектныя Т.п. для сілкавання с.-г. спажыўцоў, тэрмаапрацоўкі бетону і грунту, сілкавання помпаў і станкоў-качалак пры здабычы нафты і інш. *У.М.Сацута.*

ТРАНСФАРМА́ЦЫІ КАПІТАЛІ́ЗМУ ТЭО́РЫІ, канцэпцыі эвалюцыйнага пераўтварэння *капіталізму* пад уздзеяннем навук.-тэхн. рэвалюцыі. У адрозненне ад тэорый неакапіталізму, якія зыходзяць з магчымасці пераадолення ўнутр. супярэчнасцей капіталіст. грамадства, Т.к.т. абвяшчаюць часовы, гістарычна мінучы характар капіталізму, які ў выніку сац.-эканам. развіцця і навук.-тэхн. прагрэсу павінен пераўтварыцца ў больш дасканалую сац., эканам. і паліт. сістэму. Вытокі Т.к.т. у тэорыях 2-й пал. 19 ст. дзярж. і муніцыпальнага *сацыялізму*. Шырокае распаўсюджанне ў сацыялогіі і эканоміцы Т.к.т. атрымалі з 1930-х г. Да іх адносяцца тэорыі: *індустрыяльнага грамадства*, *постіндустрыяльнага грамадства*, грамадства дастатку (Дж.К.*Голбрэйт*), дзяржавы ўсеагульнага багацця (К.Боўлдынг, А.Хансен), пенсіённа-фондавага сацыялізму (П.Друкер), суперіндустрыяльнага, посткапіталіст., праграмавальнага, шматмернага грамадства, стагоддзя высокага масавага спажывання і інш.



Трансфарматар вымяральны: 1 — току на 115 кВ, 2 — напружання на 400 кВ са схемамі ўключэння (W_1,W_2 — першасная і другасная абмоткі; I_1,U_1 — ток і напружанне, якія вымяраюцца; I_2,U_2 — ток і напружанне ў другаснай абмотцы; А — амперметр; *V* — вольтметр).



Схема **трансфарматарнай падстанцыі** КТП 35/0,4 кВ магутнасцю 400 кВ·А: 1 — размеркавальны шчыт 0,4 кВ; 2 — паветраны ўвод ЛЭП 0,4 кВ; 3 — засцерагальнік; 4 — увод ЛЭП 35 кВ; 5 — вентыльны разраднік; 6 — сілавы трансфарматар.

ТРАНСФАРМА́ЦЫЯ (ад лац. transformatio пераўтварэнне) у грамадстве, сацыёлага-паліталагічнае паняцце, якое абазначае якасныя пераўтварэнні грамадскай арганізацыі. Адбываецца, як правіла, у крызісныя эпохі, калі сац. структура страчвае ўстойлівасць і стабільнасць. Асн. этапы Т.: ацэнка стану грамадства як крызіснага; сац. дыягностыка (пошук прычын крызісу і шляхоў выхаду з яго); ліквідацыя ўстарэлай грамадскай сістэмы, якая не адпавядае патрабаванням сац. развіцця; самавызначэнне абноўленага грамадства і планаванне далейшага развіцця. Трансфармацыйныя змены ў грамадстве характарызуюцца складанасцю і непрадказальнасцю развіцця, ростам сац. мабільнасці, абвастрэннем супярэчнасцей паміж чалавекам і грамадскай сістэмай, маргіналізацыяй часткі насельніцтва. Прыклады Т. — сац. працэсы, што адбываліся на мяжы 1980—90-х г. у краінах Цэнтр. Еўропы і з 1990-х г. у постсав. краінах, накіраваныя на рэфармаванне розных сфер жыцця: дэмакратызацыю паліт. і дзярж. сістэм, абнаўленне эканам. асноў грамадства, арыентацыю на рынкавую эканоміку, адмаўленне ад поўнага сац. забеспячэння ўсіх слаёў насельніцтва, перамену духоўна-культ. арыенціраў сац. развіцця і інш.

Літ.: Пригожин А.И. Перестройка: переходные процессы и механизмы. М., 1990; Данилов А.Н. Переходное общество: Пробл. системной трансформации. Мн., 1997; Концептуальные проблемы трансформации экономических систем. М., 1999; Шабанова М.А. Социология свободы: трансформирующееся общество. М., 2000.

С.М.Зень.

ТРАНСФАРМА́ЦЫЯ ў генетыцы, змена спадчынных уласцівасцей клеткі ў выніку пранікнення ў яе чужароднай ДНК; адзін са спосабаў абмену генет. матэрыялам у *пракарыётаў*. Натуральная Т. адкрыта і вывучана ў бактэрый (напр., Т. непатагенных бактэрый у патагенныя), але магчыма і ў клетках вышэйшых арганізмаў. Кампетэнтныя клеткі, здольныя ўключаць чужародную ДНК, сінтэзуюць асобны бялок. Пасля пранікнення ў клетку фрагмента ДНК донара адна з яе нітак распадаецца, а другая ўключаецца ў храмасому рэцыпіента за кошт рэкамбінацыі з гамалагічным участкам. Т. выкарыстоўваецца для генет. аналізу бактэрый, у якіх не-

вядомыя інш. формы абмену генет. матэрыялам (*кан'югацыі, трансдукцыі*) і эксперыментах па генет. інжынерыі. Адкрыццё і вывучэнне Т. з'явіліся доказам таго, што ДНК — матэрыяльны носьбіт спадчыннасці.

Літ.: Прозоров А.А. Генетическая трансформация и трансфекция. М., 1980.

ТРАНСФАРМІ́ЗМ (ад лац. transformis пераўтвораны), сістэма ўяўленняў аб змене і ператварэнні арган. форм, паходжанні адных арганізмаў ад другіх, якая папярэднічала *эвалюцыйнаму вучэнню*. Тэрмін выкарыстоўваўся пераважна вучонымі-эвалюцыяністамі дадарвінаўскага перыяду. Т. гістарычна быў прагрэсіўны, таму што процістаяў *крэацыянізму*.

ТРАНСФЕРА́ЗЫ (ад лац. transferre пераносіць, пераводзіць), клас *ферментаў*, якія каталізуюць міжмалекулярны перанос розных атамаў і груп атамаў (метыльных — CH_3, карбаксільных — COOH і інш.). Прысутнічаюць ва ўсіх жывых арганізмах, адыгрываюць важнейшую ролю ў рэакцыях энергет. і пластычнага абмену. Вядома больш за 450 Т. Падзяляюцца на 8 падкласаў: Т., якія каталізуюць перанос аднавугляродных, альдэгідных і кетонных астаткаў, ацыльных, гліказільных, алкільных і арыльных, азота-, фосфара- і серазмяшчальных груп. *І.М.Семяненя.*

ТРАНСФЕ́РТ (франц. transfert ад лац. transferre пераносіць, пераводзіць), 1) перадача права валодання імяннымі *каштоўнымі паперамі* (*акцыі, вэксалі, аблігацыі, чэкі*) адной асобай другой, перанос аплаты па здзелцы з аднаго рахунка на другі. Перадача права валодання ажыццяўляецца, як правіла, пры дапамозе перадатачнага надпісу — *індасаменту*. 2) Перавод замежнай валюты або золата з адной краіны ў другую; банкаўскія аперацыі па сустрэчных пераводах валют дзвюх або некалькіх краін (валютны Т.). 3) Перавод бюджэтных сродкаў для фінансавання абавязковых выплат насельніцтву: пенсій, стыпендыі, кампенсацыі, інш. сац. выплаты, якія ўстаноўлены заканадаўствам (сацыяльны Т.). 4) Перадача права ўласнасці на рэальны тавар пакупніку без фіз. перамяшчэння тавару (кніжны Т.). 5) Пераезд грамадзян з адной краіны ў другую на аснове міжнар. пагаднення, аўтаматычнае змяненне грамадзянства; перавозка турыстаў з аэрапорта ў гасцініцу або паміж гарадамі. Т. называюць таксама перадачу тэхналогій, перавод грашовых сум, гуманіт. і тэхн. дапамогі. Напр., у 2000 аб'ём Т. у Рэспубліку Беларусь склаў 54,7 млн. дол., у тл. з краін СНД — 1,2 млн. дол., Расіі — 1 млн. дол., інш. краін — 53,5 млн. дол.

І.А.Кліноўская.

ТРАНСФЕ́РТНЫЯ ПЛАЦЯЖЫ́, грашовыя выплаты з дзярж. бюджэту насельніцтву і прыватным прадпрымальнікам, што ажыццяўляюцца ў парадку перараспеделення праз бюджэт сродкаў на карысць грамадзян, якія маюць у іх большую патрэбу; адна са схем перараспеделення дзярж. бюджэтных сродкаў. Адрозніваюць тры формы Т.п.: субсідыі прыватным прадпрымальнікам, выплаты працэнтаў па дзярж. доўгу, дзярж. грашовыя выплаты на сац. патрэбы (пенсіі, дапамогі і інш.).

ТРАНСФУЗІЯЛО́ГІЯ (ад лац. transfusio пераліванне, змешванне + ...*логія*), раздзел клінічнай медыцыны, які вывучае пытанні *пералівання крыві* і яе прэпаратаў, таксама плазменных і *кровазаменных вадкасцей*. Вывучае новыя трансфузійныя сродкі; распрацоўвае тэарэт. праблемы загатоўкі, кансервавання і захавання крыві; прагназуе кірункі Т. ў залежнасці ад развіцця біялогіі, медыцыны, тэхнікі і інш.; арганізуе донарства; распрацоўвае формы арганізацыі трансфузіялагічнай службы ў сістэме аховы здароўя. Метады Т. выкарыстоўваюцца ў розных галінах медыцыны.

ТРАНСЦЭНДЭНТАЛІ́СТЫ, плынь у амерыканскай філасофіі і л-ры 1830—50-х г. Сфарміраваліся вакол «Трансцэндэнтальнага клуба» (наз. ад «трансцэндэнтальнага ідэалізму» І.*Канта*), засн. ў 1836 у г. Бостан. Лідэр Т. — Р.У.*Эмерсан*, філас. эсэ «Прырода» якога стала ідэйным маніфестам Т. Да іх далучыліся Г.Тора, Дж.Рыплі, А.Олкат, М.Фулер, О.Браўнсан, Т.Паркер, У.Г.Чанінг і інш. Яны падкрэслівалі сваё адмоўнае стаўленне да *сенсуалізму* і сваю сувязь з філасофіяй Канта, І.Г.*Фіхтэ*, Ф.Г.*Якобі*, Ф.*Шлеермахера*. На погляды Т. паўплывалі вучэнне *Платона*, этыка-сац. ідэі амер. *пурытанізму*, англ. паэтаў-рамантыкаў С.Т.*Колрыджа* і У.*Вордсварта*, філасофія Ж.Ж.*Русо* і Т.*Карлайля*. Т. выступалі супраць традыц. трактоўкі хрысціянства, заклікалі замяніць веру ў цуды ўшанаваннем «бясконцасці чалавека» і ўласцівага ўсім людзям «маральнага пачуцця», разглядалі хрысц. вучэнне як збор маральных ідэалаў, рэалізацыя якіх не патрабуе царк. ін-таў. Яны крытыкавалі амер. цывілізацыю, яе фармальныя дэмакр. ўстанаўленні і маральныя каштоўнасці. На думку Т., чалавек можа дасягнуць сапраўднай духоўнай свабоды шляхам маральнага самаўдасканалення, блізкасці да прыроды і інтуітыўнага «разгадвання» яе патаемнага сімвалічнага сэнсу, раскрыцця «Абсалюту» ў чалавечай паўсядзённасці. Імкненне Т. да рэалізацыі на практыцы сваіх маральна-сац. ідэалаў прывяло да стварэння ў 1840-х г. утапічных калоній Брук-Фарм і Фрутленд. Друкаваны орган Т. — «The Dial» («Цыферблат», 1840—44). *Н.Г.Кісялёва.*

ТРАНСЦЭНДЭНТА́ЛЬНАЕ [ад лац. transcendens (transcendentis) які выходзіць за межы], тое, што выходзіць за межы канечнага эмпірычнага свету. Тэрмін «Т.» ўведзены ў сярэдневяковай *схаластыцы* для характарыстыкі універсальных прадметаў пазнання (ісціна, адзінства, дабро і інш.). Гнасеалагічнае значэнне гэтаму паняццю надаў І.*Кант*, які пад Т. разумеў тое, што адносіцца да апрыёрных умоў пазнання і арганізуе вопыт (напр., прастора і час, субстанцыя, прычыннасць і інш.). Шырокае распаўсюджанне тэрмін «Т.» атрымаў у філас. сістэмах І.Г.Фіхтэ, Ф.Шэлінга і неакантыянства. Ням. фенаменолаг Э.Гусерль процістаўляў Т. ўсяму эмпірычнаму, а гал. мэтай фенаменалагічнай рэдукцыі абвясціў выхад на ўзровень Т. свядомасці, ачышчанай ад усіх элементаў вопыту. *Н.Г.Кісялёва.*

ТРАНСЦЭНДЭ́НТНАЕ, тое, што выходзіць за межы пачуццёвага вопыту і эмпірычнага пазнання; прадмет метафізічнага і рэлігійнага пазнання. Тэрмін «Т.» ўведзены ў сярэдневяковай *схаластыцы* як супрацьлеглы *іманентнаму*. Гнасеалагічнае значэнне гэтаму паняццю надаў І.*Кант*, які тлумачыў Т. як тое, што выходзіць па-за межы чалавечага розуму і тэарэт. пазнання і становіцца прадметам веры (напр., Бог, бессмяротнасць душы і інш.), і супрацьпастаўляў Т. і *трансцэндэнтальнае*. У крытычнай анталогіі (Н.Гартман), крытычным рэалізме (Дж.Сантаяна), неакантыянстве пад Т. разумеюцца прадметы, незалежныя ад волі і свядомасці суб'екта і недаступныя пазнанню. У рэліг. філасофіі 20 ст. (неатамізм, рэліг. экзістэнцыялізм) да Т. адносіцца ўсё звышнатуральнае, што выходзіць па-за межы пазнавальных магчымасцей чалавека.

Н.Г.Кісялёва.

ТРАНСЦЭНДЭ́НТНАЕ ЎРАЎНЕ́ННЕ, ураўненне з *трансцэндэнтнымі функцыямі* ад невядомай пераменнай. Прасцейшыя з іх — лагарыфмічныя, паказнікавыя і *трыганаметрычныя ўраўненні*. Метадаў рашэння, акрамя набліжаных, агульных для ўсіх Т.у., не існуе.

ТРАНСЦЭНДЭ́НТНАЯ ФУ́НКЦЫЯ, аналітычная функцыя, якая не з'яўляецца *алгебраічнай функцыяй*. Прасцейшыя з іх *лагарыфмічная фукнцыя, паказнікавая функцыя, трыганаметрычныя функцыі*. Характэрная прыкмета Т.ф. камплекснай пераменнай — наяўнасць асаблівасцей, адрозных ад полюсаў і пунктаў галінавання. Напр., функцыі e^z, $\sin z$ і $\cos z$ маюць істотна асаблівы пункт $z = \infty$. Т.ф. вывучаюцца ў тэорыі аналітычных функцый.

ТРАНСЦЭНДЭ́НТНЫ ЛІК, лік, які не з'яўляецца *коранем* ніякага *мнагасклада* з цэлымі каэфіцыентамі; сапраўдны ці ўяўны лік, які не з'яўляецца *алгебраічным лікам*. Існаванне Т.л. абгрунтаваў франц. матэматык Ж.Ліувіль (1844). Метады тэорыі Т.л. дастасавальныя да шэрагу праблем пры даследаваннях *дыяфантавых ураўненняў*. Т.л., напр., з'яўляюцца лік $\pi = 3{,}1415...$, лік $e = 2{,}718...$, якія шырока выкарыстоўваюцца ў матэматыцы, механіцы і фізіцы.

ТРАНСЦЭНДЭ́НЦЫЯ, філасофскае паняцце, якое абазначае пераход ад сферы пачуццёвага вопыту (прыроды) да сферы *трансцэндэнтнага*, недаступнага эмпірычнаму пазнанню. Праблема Т. займае адно з цэнтр. месцаў у *метафізіцы*. З 20 ст. паняцце Т. пашырана ў крытычнай анталогіі (Н.Гартман) для характарыстыкі пазнавальнага акта і ў экзістэнцыялізме (К.Ясперс, М.Хайдэгер) для абазначэння пераходу ад непаўнацэннага чалавечага існавання да сапраўднага — экзістэнцыі.

ТРА́НША (ад франц. tranche), 1) серыя або частка аблігацыйнай пазыкі, як правіла, міжнароднай, якая выпускаецца серыямі або з разлікам на паляпшэнне рынкавай кан'юнктуры ў будучым, або для размяшчэння пазыкі на пазыковых рынках розных краін. 2) 25-працэнтная доля для квоты ў *Міжнародным валютным фондзе*.

ТРАНШЭЕКАПА́ЛЬНІК, машына для капання *траншэй* пад трубаправоды, кабелі, дрэнажныя трубы, для раскрыцця кар'ерных палёў, асушэння балот.

Бываюць з актыўнымі рабочымі органамі — многакаўшовыя (ланцуговыя і ротарныя), скрабалкавыя (ланцуговыя і ротарныя), шнэкавыя і з пасіўнымі — плужныя, а таксама камбінаваныя; на пнеўмаколавым і гусенічным ходу або на базе трактара з дадатковай каробкай перадач, якая памяншае скорасць яго руху. Кіраванне рабочых органаў — канатнае або гідраўлічнае, прывод — ад сілавой установкі з дапамогай мех. або гідраўл. перадачы, у траншэйных экскаватарах — электрапрывод. *В.М.Кандрацьеў.*

ТРАНШЭ́ЛІЯ (Transchelia), род іржаўных грыбоў сям. пукцыніевых. 10 відаў. Пашыраны ўсюды. Выклікаюць *іржу раслін*. На Беларусі найб. вядомая Т. слівавая (T. pruni-spinosae) — узбуджальнік пераважна іржы слівы.

Мішэлій міжклетачны з *гаўсторыямі*, праз якія грыб паглынае пажыўныя рэчывы з клетак расліны-гаспадара. Спермагоніі (*пікніды*) амаль шарападобныя, ад карычневых да чорных. Эцыдыі (умяшчальня для двух'ядзерных спор — эцыдыяспор) адзіночныя, чашападобныя, ярка-жоўтыя. Эцыдыяспоры ў ланцужках, пакрытыя бародаўчатай абалонкай, пры пападанні на лісце з іх развіваюцца парошыстыя пустулы, дзе знаходзяцца летнія споры (урэдаспоры). За лета адбываецца некалькі такіх спаранашэнняў. У канцы лета на іх месцы развіваюцца новыя пустулы, што маюць двухклетачныя, з глыбокай перацяжкай пасярэдзіне тэлейтаспоры, якія распадаюцца на 2 клеткі (характэрная адзнака роду). Служаць для перазімоўкі грыба. *С.І.Бельская.*



Абсталяваны ўчастак **траншэі** на пазіцыі аддзялення: 1 — перакрытая шчыліна; 2 — ніша; 3 — вынесеная ячэйка з пляцоўкамі для кулямёта; 4 — запасная пляцоўка для кулямёта; 5 — вынесены акоп для процітанкавага гранатамёта; 6 — перакрытая байніца і казырок над вынесенай ячэйкай; 7 — ход зносін; 8 — сховішча.

ТРАНША́ТА (?—1264), вялікі князь ВКЛ [1263—64], пляменнік (сын сястры) *Міндоўга*. Упершыню згадваецца ў ліфляндскай «Старэйшай рыфмаванай хроніцы» ў сувязі з падзеямі 1260—61, калі Жамойць пазбавілася часовай залежнасці ад Полацкага княства. Пасля смерці Міндоўга (1263) Т. разам з Войшалкам і Таўцівілам выступіў супраць Войшалкавага пераемніка Рынгольта Міндоўгавіча. Пасля забойства Рынгольта (1264) Т. стаў вялікім князем ВКЛ, але неўзабаве быў забіты.

ТРАНША́ЖНЫЯ РАБО́ТЫ, комплекс работ, звязаных з будаўніцтвам падземных інжынерных збудаванняў (трубаправодаў, кабельных ліній, дрэнажных сістэм і інш.) шляхам рыцця траншэй. Т.р. ўключаюць капанне траншэй, укладку ў іх трубаправодаў, кабеляў, дрэнажных труб, засыпку траншэй, а таксама для аховы асабовага складу і ўзбраення ад сродкаў паражэння праціўніка.

Глыбіня Т. да 2 м. Каб пазбегнуць страт ад агню праціўніка, Т. робяць у выглядзе ламаных (крывалінейных) або звілістых ліній. У пярэдніх і задніх стромкасцях абсталёўваюць стралк. і гранатамётныя *ячэйкі*, кулямётныя пляцоўкі, падбрустверныя *бліндажы*, *ніши*, асобныя ўчасткі перакрываюць. Паміж Т. адкопваюць хады злучэнняў. Т. выкарыстоўвалі з даўніх часоў. У 15—19 ст. іх наз. земляныя равы і выкарыстоўвалі пры аблогах крэпасцей, у т.л. на тэр. ВКЛ; у арміі Рас. імперыі — пры абароне Севастопаля 1854—55, *Порт-Артура абароне 1904—05*. Адыгрывалі значную ролю ў 1-ю, 2-ю сусв. войны і ў ваен. канфліктах 2-й пал. 20 ст.



Траншэекапальнік з канічным шнэкам (канструкцыя БелНДІ МіЛ): 1 — трактар; 2 — навясное прыстасаванне; 3 — кідальнік; 4 — рабочы орган (канічны шнэк); 5 — карданны вал.



Рабочыя органы **траншэекапальнікаў**: а, б — ланцуговы і ротарны многакаўшовыя (1 — зачышчальны скрабок; 2 — коўш; 3 — транспарцёр; 4 — ротар); в — шнэкавы (1 — шнэк; 2 — адвал); г — плужны (1 — плужны рабочы орган; 2 — гідрацыліндр; 3 — апорнае кола).

ці ад крыжакоў і перайшла пад уладу Міндоўга. Т. быў яго намеснікам у Жамойці і адным з найбліжэйшых дарадцаў, ідэолагам сумеснай барацьбы ўсіх балцкіх народаў супраць Тэўтонскага ордэна. Адзін з арганізатараў забойства Міндоўга ў 1263, пасля чаго атрымаў велікакняжацкую ўладу. Сутыкнуўшыся з прэтэнзіямі на ўладу з боку полацкага кн. *Таўцівіла*, забіў яго. Неўзабаве сам быў забіты змоўшчыкамі — прыхільнікамі Міндоўга. *В.Л.Насевіч.*

ТРАП (галандскае trap), 1) лесвіца на караблі. Бывае вяровачны, драўляны і металічны; пастаянны і здымны; нахільны ці вертыкальны. Адрозніваюць парадны Т. — пад'ёмны забортны для сувязі ў час стаянкі паміж суднам і прычалам або інш. суднам; штормтрап — вяровачная лесвіца, якая выкарыстоўваецца на неспакойным моры або на стаянцы для сувязі паміж суднамі. Таксама Т. наз. прыстаўная (пад'язная) лесвіца для пасадкі (высадкі) у самалёт, верталёт. 2) Спец. лесвіца рознага прызначэння (напр., гімнастычны Т.).

ТРАП у геалогіі, эфузіўныя намнажэнні (лавы, туфы, туфабрэкчыі) асн. саставу, з вял. колькасцю інтрузіўных пластавых жыл (сілаў), з характэрнай прыступкавай паасобнасцю. Утвараюцца ў кантынент. умовах пры выліванні магмы з вял. глыбінь. У склад трапавых тоўшчаў уваходзяць *базальты, дыябазы*, дылерыты, аўгітавыя і інш. парфіры ты. Пашыраны на стараж. платформах, напр., на п-ве Індастан, ва Усх. Сібіры, у Паўд. Афрыцы, Паўд. Амерыцы. З Т. звязаны радовішчы алмазаў, ісландскага шпату, цэалітаў, графіту, медна-нікелевых руд і інш.

«ТРАПА́К», бел. нар. мужчынскі імправізацыйны танец рус. паходжання. Муз. памер 2/4. Тэмп хуткі. Мае характэрныя рысы мясц. танц. традыцый. Асн. рухі: прытупы, дробныя крокі (драбнякі), прысядкі. Выконваецца весела, зухавата на кірмашах, вячорках, бяседах і інш. Зафіксаваны ў пач. 20 ст. на Віцебшчыне. Пашыраны і на Украіне. *Л.К.Алексютовіч.*

ТРАПА́ННЕ, ачыстка ад дамешкаў і разрыхленне валакністага матэрыялу (лён, бавоўна, шэрсць і інш.); адзін з асн. працэсаў *прадзення*. У даўнейшым сял. побыце Т. рабілася ўручную пры дапамозе *трапла*. У прадзільнай вытв-сці ажыццяўляюць на трапальных машынах.

У працэсе Т. рабочыя органы трапальнай машыны (асн. з іх — нажавыя, калковыя ці більныя барабаны і траплы) напачатку адбіваюць масу валакністага матэрыялу, каб разрыхліць яго і аддзяліць ад кастрыцы, а пасля валокны раздзяляюць на дробныя пучкі і ачышчаюць ад няўчэпістых дамешкаў. Гл. таксама *Льноапрацоўчыя машыны, Канаплеапрацоўчыя машыны.*

ТРАПАПА́ЎЗА (ад грэч. tropos паварот, змена + *паўза*), пераходны слой паміж *трапасферай* і *стратасферай*. Таўшчыня ад некалькіх соцень метраў да 2—3 км. Выш. вагаецца ў залежнасці ад геагр. шыраты (у палярных шыротах 8—10 км, над экватарам 16—18 км), пары года (зімой ніжэйшая, чым летам) і цыкланічнай дзейнасці (у цыклонах ніжэйшая, у антыцыклонах вышэйшая). У субтропіках назіраюцца разрывы Т., абумоўленыя магутнымі *струменнымі плынямі*, у сувязі з чым адрозніваюць Т. нізкую цёплую палярную і высокую халодную трапічную.

ТРАПАСФЕ́РА (ад грэч. tropos паварот, змена + *сфера*), ніжні, асноўны слой *атмасферы* паміж паверхняй Зямлі і *стратасферай* на выш. 8—10 км у палярных, 10—12 км ва ўмераных і 16—18 км у трапічных шыротах. Ад стратасферы аддзелена пераходным слоем — *трапапаўзай*. Характарызуецца панiжэннем т-ры з вышынёй на 0,65 °С на 100 м, моцным развіццём турбулентнасці і канвекцыі. У ніжняй Т. частыя *інверсіі тэмпературы*. Утрымлівае каля 80% атм. паветра і асн. масу вадзяной пары, тут фарміруюцца амаль усе воблакі, туман. Атм. ціск з вышынёй памяншаецца, скорасць ветру нарастае. У верхняй Т. назіраюцца *струменныя плыні*, у ніжняй пераважаюць вятры зах. і ўсх. напрамкаў, сезонныя (*мусоны*) і пастаянныя (*пасаты*). У Т. ўтвараюцца *франты атмасферныя*, развіваюцца *цыклоны, антыцыклоны* і інш. атм. працэсы, якія вызначаюць надвор'е і клімат. Ніжняя Т. моцна запыленая. Самыя ніжнія дзесяткі метраў у Т. ўтвараюць прыземны слой атмасферы.

ТРАПАСФЕ́РНАЯ РАДЫЁСУВЯЗЬ, далёкая *радыёсувязь*, якая грунтуецца на пасіўным адбіцці радыёхваль неаднастайнасцямі *трапасферы*. Ажыццяўляецца ў дыяпазонах дэцыметровых і сантыметровых хваль.

Перавыпрамяненне эл.-магн. энергіі ў трапасферы, абумоўленае неаднастайнасцю яе дыэлектрычнай пранікальнасці, адбываецца ў вобласці перасячэння дыяграм накіраванасці перадавальнай і прыёмнай антэн. Для забеспячэння ўстойлівасці Т.р. адлегласці паміж пунктамі перадачы і прыёму абмяжоўваюць 500 км і выкарыстоўваюць перадатчыкі з вял. выхаднай магутнасцю (да 10 кВт і больш), высокаадчувальныя прыёмнікі, антэны вял. памераў, а таксама спец. метады для змяншэння ўплыву замiранняў сігналаў. З развіццём *спадарожнікавай радыёсувязі* Т.р. страчвае сваё значэнне. *Э.Б.Ліпковіч.*

ТРАПАФІ́ТЫ [ад грэч. tropos паварот, змена + *...фіт*(ы)], расліны, якія прыстасаваліся да жыцця ў абласцях з рэгулярнай зменай вільготнага і сухога сезонаў. Водна-цеплавы баланс падтрымліваюць з дапамогай арыентацыі лісця, зменай буйнога лісця на дробнае і іх скідваннем у неспрыяльных умовах. Сустракаюцца сярод розных жыццёвых форм раслін.

ТРАПАЧЫ́НСКАЯ-АГА́РАК (Trapaczyńska-Ogarkowa) Вераніка (8.1.1908, г. Львоў, Украіна — 10.5.1957), польская пісьменніца. У 1930-я г. настаўнічала каля Баранавіч, пасля Вял. Айч. вайны працавала ў друку і на радыё Польшчы. Аўтар аўтабіягр. рамана «Лясныя Долы» (1954) пра жыццё і рэв. барацьбу ў зах.-бел. вёсцы, гіст. рамана «Салдаты Касцюшкі» (1952—56) і інш. На бел. мову яе раман «Лясныя Долы» пераклаў М.Лужанін.

Тв.: Бел. пер. — Лясныя Долы. Мн., 1958. *А.В.Мальдзіс.*

ТРАПА́ШКА Людміла Іванаўна (н. 4.2.1946, в. Капусціна Валожынскага р-на Мінскай вобл.), бел. вучоны ў галіне аховы раслін. Д-р біял. н. (1999). Скончыла Ленінградскі с.-г. ін-т (1972). З 1972 у Бел. НДІ аховы раслін. Навук. працы па праблемах прагназавання феналогіі развіцця збожжавых культур, дынамікі колькасці і шкоднасці асн. фітафагаў; разліку эколага-эканам. парогаў шкоднасці. Прапанавала канцэпцыю, методыку і інтэгральныя паказчыкі экалагічнай бяспекі тэхналогій аховы раслін.

Тв.: Краткосрочный прогноз фенологии растений, численности и вредоносности фитофагов на яровых зерновых культурах. Мн., 1999; Экономическая, энергетическая эффективность и экологическая безопасность систем защиты растений. Мн., 2000.

ТРА́ПЕЗНАЯ, трапеза (ад грэч. trapeza стол, ежа), 1) у хрысціянскіх манастырах спец. будынак з залай для сумесных трапез, з царквой і дапаможнымі памяшканнямі. У некат. манастырах існуюць трапезныя цэрквы (трапезная Ефрасіннеўская царква Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра ў г. Полацк). У 16—17 ст. мелі вял. 1-, 2-стоўпныя або бясстоўпныя залы з адкрытымі тэрасамі і лесвіцамі, багатым дэкар. убраннем. 2) Прасторная невысокая прыбудова з зах. боку хрысц. храма, якая служыць для багаслужэння ў зімовы час і грамадскіх патрэб прыхаджан. Т. найб. характэрны для архітэктуры 17—18 ст., пашыраны ў пабудовах псеўдарус. стылю (канец 19 — пач. 20 ст.). 3) У храме — прастол (святая трапеза) з сімвалічнымі ежай і пітвом («целам» і «крывёй» Ісуса Хрыста). *Г.А.Лаўрэцкі.*

ТРАПЕ́ЗНІКАЎ Вадзім Аляксандравіч (28.11.1905, Масква — 15.8.1994), расійскі вучоны ў галіне аўтаматыкі і сістэм кіравання. Акад. Рас. АН (1960, чл.-кар. 1953), Герой Сац. Працы (1965). Скончыў Маскоўскае вышэйшае тэхн. вучылішча (1928). З 1941 у Ін-це праблем кіравання АН СССР (з 1951 дырэктар). З 1959 старшыня Нац. к-та СССР па аўтам. кіраванні. У 1965—78 нам. старшыні Дзярж. к-та Савета Міністраў СССР па навуцы і тэхніцы. Навук. працы па разліках і канструяванні эл. машын і трансфарматараў, аўтаматыцы і працэсах кіравання, метадах мадэлявання сістэм аўтам. рэгулявання, эфектыўнасці навук.-тэхн. прагрэсу. Дзярж. прэміі СССР 1951, 1976. Ленінская прэмія 1981.

Тв.: Управление и научно-технический прогресс. М., 1983.

ТРАПЕЗУ́НДСКАЯ ІМПЕ́РЫЯ, дзяржава ў 13—15 ст. на ПнЗ М. Азіі са сталіцай у г. Трапезунд (сучасны Трабзон). Узнікла ў выніку распаду *Візантыі* пасля захопу Канстанцінопаля ўдзельнікамі 4-га крыжовага паходу ў 1204. Заснавальнікі Т.і. — унукі візант. імператара Андроніка I Камніна Аляксей і Давід Камніны ўсталявалі з дапамогай Грузіі сваю ўладу над Трапезундам і прыбярэжнай паласой з гарадамі Сіноп, Амастрыда, Іраклія. Першым імператарам абвешчаны Аляксей [1204—22]. Імператары называлі сябе Вялікімі Камнінамі. У 1214 Т.і. страціла Амастрыду (далучана да *Нікейскай імперыі*) і Сіноп (захоплены *Канійскім султанатам*). У 1461 тур. султан *Мехмед II* заваяваў Т.і. і далучыў яе да *Асманскай імперыі*.

Літ.: Успенский Ф.И. Очерки из истории Трапезунтской империи. Л., 1929; Карпов С.П. Трапезундская империя и западноевропейские государства в XIII—XV вв. М., 1981.

ТРАПЕЦО́ЭДР (ад *трапецыя* + грэч. hedra аснова, грань), тэтрагон-трыактаэдр, простая форма крышталёў, грані якой чатырохвугольнікі з адной парай роўных старон. Адрозніваюць Т. правыя і левыя. У залежнасці ад гал. восі сіметрыі (L_3, L_4, L_6) Т. бываюць 6-, 8-, і 12-гранныя. Такую форму крышталёў маюць мінералы: кварц, рэтжэрсіт, галеніт, флюарыт і інш.

ТРАПЕ́ЦЫЯ (ад грэч. trapezion літар. — столік), выпуклы чатырохвугольнік, у якога 2 процілеглыя стораны (асновы) паралельныя, а 2 іншыя (бакавыя) непаралельныя.

Адлегласць h паміж асновамі наз. вышынёй. Адрэзак, які злучае сярэдзіны бакавых старон Т., наз. яе сярэдняй лініяй; яна паралельная асновам a і b, даўжыня яе роўная іх паўсуме. Плошча Т. $S = 0{,}5\ (a + b) \cdot h$. Калі бакавыя стораны роўныя, Т. наз. роўнабаковай, калі адна з бакавых старон перпендыкулярная аснове — прамавугольнай.



Трапецыя ABCD: *MN* — сярэдняя лінія; *AE* — вышыня.

ТРАПІ́ЗМЫ (ад грэч. tropos паварот, кірунак), накіраваныя роставыя рухі (выгіны) органаў раслін, якія выклікаюцца аднабаковым уздзеяннем фактараў асяроддзя (святла, зямнога прыцяжэння, хім. рэчываў і інш.). Аснова Т. — *раздражняльнасць*. Узнікаюць у ч. раслін, што растуць, і з'яўляюцца вынікам больш хуткага росту клетак на адным баку сцябла, кораня ці ліста ў залежнасці ад размеркавання гармону росту раслін (*ауксіну*). Пры станоўчых Т. рух накіраваны ў бок раздражняльніка, пры адмоўных — ад яго. Шляхам арыентацыі органаў у прасторы Т. забяспечваюць найб. эфектыўнае выкарыстанне пажыўных фактараў, ахову ад шкодных уздзеянняў. У залежнасці ад прыроды раздражняльніка адрозніваюць тэрма-, фота-, гідра-, хема-, геа- і інш. віды Т. Гл. таксама *Настыі*.

ТРАПІ́НІН Васіль Андрэевіч (30.3.1776, с. Карпава Наўгародскай вобл., Расія — 15.5.1857), рускі жывапісец-партрэтыст.



В.**Трапінін**. Каруначніца. 1823.

Акад. Пецярбургскай АМ (1824). Ганаровы чл. Маскоўскага маст. т-ва (1843). Да 1823 прыгонны. Скончыў Пецярбургскую АМ (1804). У 1804—12 і 1818—21 жыў на Украіне, з 1821 у Маскве. Стварыў больш за 3 тыс. партрэтаў жыхароў Масквы. Раннія творы вызначаюцца інтымнасцю вобразаў, пяшчотным каларытам, вытрыманым у лёгкай шараватай гаме: партрэты жонкі (1809), сына (1818), М.Карамзіна (1815). Дэтальная характарыстыка мадэлі, часам скульптурная дакладнасць аб'ёмаў, маляўнічасць колеравага ладу, унутр. дынаміка ўласцівы партрэтам П.Булахава (1823), К.Равіча (1825), А.Пушкіна (1827), якія вылучаюцца шырокай жывапіснай манерай, эфектным выкарыстаннем ценяў. Для твораў 1830—40-х г. характэрны складанасць кампазіцыі, узмацненне ролі дэталей, вострахарактарнасць: партрэт В.Зубавай (1834), аўтапартрэт (1846). Стварыў карціны з рамант. рысамі (партрэт К.Брулова, 1836), а таксама тып жанравай, крыху ідэалізаванай выявы чалавека з народа: «Каруначніца» (1823), «Гітарыст» (1832), «Старая з курыцай» (1856). Творчасць Т. паўплывала на развіццё рус. мастацтва 19 ст.

Літ.: Амшинская А.М. В.А.Тропинин. М., 1976; В.А.Тропинин: Исслед., материалы. М., 1982.

Л.Л.Чэбан.

ТРАПІ́ЧНАЕ ПАВЕ́ТРА, *паветраныя масы*, якія фарміруюцца на працягу года ў трапічных і субтрапічных шыротах, а таксама летам у кантынент. раёнах, на Пд умераных шырот (Пд Еўропы, Казахстан, Сярэдняя Азія і інш.). Узаемадзейнічае з *умераных шырот паветрам*, ад якога аддзелена *палярным фронтам*, і з *экватарыяльным паветрам*, ад якога аддзелена ўнутрытрапічнай зонай канвергенцыі. Кантынент. Т.п. вызначаецца вельмі высокімі летнімі т-рамі, нізкай адноснай вільготнасцю, няўстойлівай стратыфікацыяй і значнай запыленасцю. Марское Т.п. адрозніваецца адносна высокай т-рай, вял. вільготнасцю і ўстойлівай стратыфікацыяй.

ТРАПІ́ЧНЫ ГОД, гл. ў арт. *Год*.

ТРАПІ́ЧНЫ КЛІ́МАТ, клімат трапічных шырот у Паўн. і Паўд. паўшар'ях Зямлі, як правіла, сухі і гарачы. Фарміруецца на працягу года пад уплывам абласцей павышанага ціску субтрапічных паясоў, пасатнай цыркуляцыі над акіянамі і дэпрэсіямі тэрмічнага паходжання над мацерыкамі. Адрозніваецца ўстойлівай перавагай малавоблачнага надвор'я, малой колькасцю ападкаў (звычайна менш за 200 мм за год), высокімі т-рамі паветра (ад 10 °С зімой да 35 °С летам). Тут знаходзяцца *полюсы цяпла*. Пераважаюць ландшафты пустынь і паўпустынь. У некат. класіфікацыях да Т.к. адносяць таксама клімат саваннаў (з рэзка выяўленым сухім зімовым і вільготным летнім сезонамі). Гл. таксама *Пасатны клімат*.

ТРАПІ́ЧНЫ ФРОНТ, атмасферны фронт паміж трапічнымі і экватарыяльнымі паветранымі масамі; часта атаясамліваецца з унутрытрапічнай зонай канвергенцыі. З Т.ф. звязана выпадзенне вял. колькасці ападкаў.

ТРАПІ́ЧНЫ ЦЫКЛО́Н, трапічны ўраган, магутны атмасферны віхор у трапічных шыротах. Узнікае паміж 5—20° паўн. і паўд. шырот і рухаецца ў пасатным патоку на З (ПнЗ у Паўн. і ПдЗ у Паўд. паўшар'ях). У параўнанні з *цыклонамі* ўмераных шырот адрозніваецца меншымі памерамі (да 300—400 км) і значна большымі барычнымі градыентамі, выключна моцнымі вятрамі (да 70 м/с, у парывах больш за 100 м/с). Суправаджаецца катастрафічнымі ліўневымі ападкамі і навальніцамі, выклікае моцнае хваляванне на моры і разбурэнні ў прыбярэжных раёнах. Унутр. ч. Т.ц. называюць *вокам буры*. Штогод на Зямлі адзначаюць 70—80 Т.ц. Каля берагоў Усх. Азіі наз. *тайфунамі*.

ТРАПІ́ЧНЫЯ ДАЖДЖЫ́, тое, што *зенітальныя дажджы*.

ТРАПІ́ЧНЫЯ ЛЯСЫ́. Пашыраны ў экватарыяльным, субэкватарыяльных і *трапічных паясах* паміж 25° паўн. ш. і 30° паўд. ш. У залежнасці ад ступені ўвільгатнення, выражанасці і працяг-

ласці сухога сезона адрозніваюць Т.л.: вечназялёныя *вільготныя трапічныя лясы*; паўвечназялёныя або паўлістападныя сухія (да 40 м вышыня дрэвастою, багаты фларыстычны склад, у т.л. ліяны і эпіфіты, чаёам з выражаным лістападам і ўзнаўленнем лісця; у тропіках Азіі наз. *мусоннымі лясамі*); лістападныя светлыя ў трапічных раёнах Індакітая з выражаным сухім сезонам (дыптэракарп бугрысты, пентакмэ сіямская, тэрміналія лямцавая, на бедных глебах хваёвыя лясы); горныя — на схілах гор вышэй за 800 м у паласе кандэнсацыі туманаў — нефелагілеі (вечназялёныя з дрэвападобнымі папарацямі, некат. хвойнымі і араўкарыямі), вышэй за 2000 м — імшыстыя і нізкарослыя з сям. лаўровых, букавых, верасковых (у лясах Гімалаяў і Кітая шмат дрэвападобных рададэндранаў, эпіфітных імхоў). З-за падабенства да лясоў умераных шырот горныя Т.л. наз. субтрапічнымі. Т.л. даюць шмат каштоўнай прадукцыі і драўніны (каўчуканосы, гваздзіковае, цікавае, салавае дрэвы і інш.).

ТРАПІ́ЧНЫЯ ПАЯСЫ́, прыродныя геагр. паясы Паўн. і Паўд. паўшар'яў, размешчаныя паміж *субтрапічнымі паясамі* і *субэкватарыяльнымі паясамі*, паміж 20° і 30° паўн. ш. і паўд. ш. Гарачы і сухі трапічны клімат вызначаюць антыцыкланальная цыркуляцыя атмасферы і пасаты. Т-ра зімой вышэй за 10 °С, летам вышэй за 30—35 °С. У Т.п. назіраюцца самыя высокія на зямным шары т-ры паветра (гл. *Полюсы цяпла*). Ападкаў 50—200 мм, на У пераважае вільготнае акіянскае паветра (мусонная цыркуляцыя) — ападкаў да 1000—2000 мм і больш за год. На сушы ландшафты пустынь і паўпустынь, якія займаюць вял. тэрыторыі ў цэнтр. і зах. ч. мацерыкоў (асабліва ў Афрыцы і Азіі). Значная ч. прасторы не мае паверхневага сцёку. Рэкі транзітныя, многія перасыхаюць. Глебавае покрыва мяняецца з З на У ад шкілетных або шэра-жоўтых глеб трапічных пустынь праз шэра-карычневыя глебы паўпустынь і чырвона-карычневыя глебы рэдкалессяў да чырв. латэрытных глеб пераменна-вільготных лясоў. Усх. ўскраіны мацерыкоў (Паўд. і Усх. Азія, Цэнтр. Амерыка) маюць больш высокую вільготнасць, паўнаводныя рэкі, мяшаныя лістападна-вечназялёныя лясы, мусонныя лістападныя лясы, рэдкалессі або саванны і хмызнякі, часта моцна зменены ў выніку высечак і выпальвання. У горных раёнах выражаны леса-лугавы (на У), рэдкалесна-стэпавы і пустынна-стэпавы (у цэнтр. ч. і на З) спектры вышыннай пояснасці. Жывёльны свет прадстаўлены капытнымі (антылопы, вярблюды і інш.), некат. драпежнымі (гіены, лісы і інш.), птушкамі, грызунамі і інш. Акіян у Т.п. адрозніваецца высокімі т-рамі паверхневых вод, значным іх выпарэннем, высокай салёнасцю (37‰), шчыльнасцю і недахопам кіслароду. У зах. і цэнтр. ч. мацерыкоў развіта пашавая жывёлагадоўля, арашальнае земляробства, ва ўсх. ч. — арашальнае і багарнае земляробства, плантацыйная гаспадарка (рыс, батат, цытрусавыя, фінікі, ананасы, бананы і інш.). *М.В.Лаўрыновіч.*

ТРА́ПКІН Мікалай Іванавіч (5.12.1918, в. Сабліна Старыцкага р-на Цвярской вобл., Расія — 20.2.1999), рускі паэт. Вучыўся ў Маскоўскім гіст.-архіўным ін-це (1939—41), скончыў Вышэйшыя літ. курсы ў Маскве (1958). Друкаваўся з 1945. Яго паэзія адметная спалучэннем фальклорна-песеннай і кніжнай традыцый, напеўнасцю, разнастайнасцю форм. Аўтар паэт. зб-каў «Першая баразна» (1953), «Белая ноч» (1956), «Краснаполле» (1962), «Гняздо маіх бацькоў» (1967), «Гусі-лебедзі» (1971), «Вячэрні звон» (1975), «Запаведзь» (1976), «Скрып маёй калыскі» (1978), «Вогненныя яслі» (1985) і інш.; паэм («Сярод лясоў і палёў», 1964). У некат. яго вершах бел. тэма. Дзярж. прэмія Расіі 1992.

Тв.: Стихотворения. 1940—1982. М., 1983; Излуки. М., 1987.



ТРАПЛО́, трапушка, прылада для ачышчэння (трапання) ільнянога ці канапляного валакна ад кастрыцы. Уяўляе сабой тонкую дошчачку шыр. 6—8 см, даўж. 40—45 см. На тэр. ўсх. славян Т. вядома з 7 ст. На Беларусі бытавалі 2 асн. тыпы Т. — мечападобнае (пашырана на ПдЗ і ў цэнтр. раёнах) і лапатападобнае (на Пн і У).



Трапло: мечападобнае (уверсе) і лапатападобнае.

«ТРАПЯТУ́ХА», бел. нар. танец, разнавіднасць *полькі*. Муз. памер 2/4. Тэмп жвавы. Выконваецца парамі, якія кружацца то ўправа, то ўлева вальсападобнай польскай з прытупам. Пасля выкрыку «круг» выканаўцы мяняюцца парамі — дзяўчына пераходзіць «пляцёнкай» да юнака, які стаіць побач. Партнёры кланяюцца адзін аднаму і падаюць руку. Пасля таго, як юнак перакруціць дзяўчыну, яны становяцца тварам адзін да аднаго і дробна патрэсваюць плячыма, рукамі і нагамі. Потым фігуры паўтараюцца. Танец суправаджаецца прыпеўкамі. Зафіксаваны ў Чэрвеньскім і Бярэзінскім р-нах. *Л.К.Алексютовіч.*

ТРАС (ням. Trass), горная парода, устарэлая назва разнавіднасці *туфу вулканічнага*. Цвёрдая, светлая, лёгкая, пористая маса, звычайна зялёнага, жоўтага, шэрага або бурага колеру; мае ў сабе аморфную крэменекіслату. Выкарыстоўваецца як дабаўка да портландцэменту, у якасці адсарбентаў і малекулярных сітаў. Найб. вядомы Т. Святой гары ў Карадагскім запаведніку (Крым, Украіна).

ТРА́СА (ад ням. Trasse напрамак лініі, шляху), 1) лінія, якая вызначае напрамак руху ці гранічную вось дарогі, канала, чыгункі, лініі электраперадач і сувязі, трубаправода і інш. 2) Устаноўлены маршрут рэгулярных палётаў самалётаў, руху воднага транспарту паміж вызначанымі пунктамі; таксама іншая дарога, якая злучае важныя аб'екты, населеныя пункты. 3) Вогненны ці дымавы след у паветры, які пакідае трасіруючая куля, снарад і пад.

ТРАСАЛО́ГІЯ (ад франц. trace след + ...*логія*), раздзел *крыміналістыкі*, які вывучае сляды і распрацоўвае прыёмы, метады і навук.-тэхн. сродкі іх выяўлення, фіксацыі і даследавання. Адрозніваюць сляды: чалавека, прылад злачынства, ін-

струментаў, вытв. механізмаў, трансп. сродкаў. Трасалагічная ідэнтыфікацыя аб'екта ажыццяўляецца шляхам супастаўлення яго агульных і прыватных прыкмет з прыкметамі, што адбіліся ў следзе. Трасалагічная экспертыза дазваляе ідэнтыфікаваць чалавека па слядах рук, ног, зубоў; абутак — па яго слядах; прылада злачынства і інструменты — па слядах злому, разрэзу, рассячэння і г.д.; трансп. сродак — па слядах ад хадавой часткі, ад выступаючых дэталей. Т. шырока выкарыстоўваецца ў практыцы расследавання злачынстваў.

ТРАСІРАВА́ЛЬНЫЯ САСТА́ВЫ, агнявыя і дымавыя *піратэхнічныя саставы*, што пакідаюць бачны след траекторыі палёту куль і снарадаў. Вызначаюцца здольнасцю ўтвараць пры гарэнні вял. колькасць цвёрдых шлакаў. Найб. пашыраны агнявыя Т.с., гараць каляровым (пераважна чырв., чырв.-аранжавым, жоўтым) або белым полымем, іх траса бачная і ўдзень, і ўначы. Траса дымавых Т.с. у выглядзе дымавога шлейфа бачная толькі ўдзень. Вырабляюць парашкападобныя і грануляваныя. Выкарыстоўваюць для начынкі трасёраў, якія прымацоўваюць да боепрыпасаў.

ТРАСКА́ (Gadus) род рыб сям. трасковых. Пашыраны ў морах паўн. ч. Атлантычнага і Ціхага акіянаў. 1 від — Т. атл.



Траска.

(G. morhua) з падвідамі: балт., або дорш; беламорская; грэнландская; кільдзінская; ціхаакіянская. Паводле інш. класіфікацый да асобных відаў адносяць Т. грэнландскую (G. ogac) і Т. ціхаак. (G. macrocephalus). Мае фіёрдавыя і азёрныя формы. Жыве ў прыдонных слаях вады на глыб. да 300 м. У Атлантыцы робіць кармавыя і нераставыя міграцыі да 2 тыс. км.

Даўж. да 180 см, маса да 40 кг. Спіна зеленавата-аліўкавая з дробнымі жаўтаватымі плямамі, бруха і бакі светлыя. 3 спінныя, 2 анальныя плаўнікі. На ніжняй сківіцы вусік. Корміцца рыбай і ракападобнымі. З печані Т. атрымліваюць *рыбін тлушч*. Аб'ект промыслу. *А.М.Петрыкаў.*

ТРАСТА́, сцёблы (салома) лёну, канапель, некат. паўд. лубяных культур (джут, кенаф), лубяныя пучкі якіх ачышчаны ад знешніх тканак; сыравіна для тэкст. прам-сці. Салому апрацоўваюць біял. (вымочванне), цеплавым ці хім. спосабам для разбурэння пекцінавых рэчываў, што звязваюць лубяныя пучкі і драўніну. З Т. мех. спосабам атрымліваюць валакно для прадзення і кастрыцу (адраўнелыя ч. сцёблаў, т.зв. адходы, якія ідуць на выраб цэлюлозы, паперы, буд. і тэрмаізаляцыйных пліт).

В.М.Прохараў.

«ТРАСУ́ХА», бел. нар. танец, найб. пашыраная разнавіднасць *полькі*. Муз. памер 2/4. Тэмп хуткі. У аснове танца складанае каардынаванае спалучэнне патрэсвання плячыма са спружыністым крокам. Зафіксаваны ў 19 ст.

ТРАСУ́ЧАЎ Павел Маркавіч (3.7.1938, г. Томск, Расія), бел. вучоны ў галіне анатоміі чалавека. Д-р мед. н., праф. (1987). Скончыў Новасібірскі мед. ін-т (1961). З 1987 у Віцебскім мед. ун-це (у 1987—97 заг. кафедры). Навук. працы па вывучэнні кірункаў і межаў адаптацыі лімфавузлоў пры апрамяненні, халестэрынавай нагрузцы і пратэкцыі фосфаліпідамі.

Тв.: Рентгеноанатомия. Витебск, 2001 (разам з М.А.Нікольскім).

ТРАСЦІНО́, вёска ў Хоцімскім р-не Магілёўскай вобл., каля р. Беседзь, на аўтадарозе Хоцімск—Клімавічы. Цэнтр сельсавета і саўгаса. За 10 км на ПнЗ ад г.п. Хоцімск, 217 км ад Магілёва, 47 км ад чыг. ст. Камунары. 686 ж., 258 двароў (2002). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі. Свята-Мікольская царква (19 ст.). Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ТРАСЦЯНЕ́ЦКІ ЛА́ГЕР СМЕ́РЦІ ў Вялікую Айчынную вайну. Створаны ням. фашыстамі ў ліст. 1941 каля в. Малы Трасцянец Мінскага р-на (цяпер у межах г. Мінск) для масавай загубы сав. грамадзян і ваеннапалонных, паліт. вязняў ням. турмаў і лагераў, яўрэяў з Аўстрыі, Германіі, Польшчы, Чэхаславакіі. Тут працавала крэмацыйная печ, з Мінска рэгулярна прывозілі вязняў у машынах-душагубках. Масавыя расстрэлы людзей праводзіліся ва ўрочышчы Благаўшчына (да кастр. 1943 загінула 150 тыс. чал.), потым ва ўрочышчы Шашкоўка (каля в. Шабаны, цяпер у межах г. Мінск, загінула больш за 50 тыс. чал.), дзе была пабудавана спец. яма-печ. Попел з печаў выкарыстоўвалі як угнаенне на палях размешчанай паблізу дапаможнай гаспадаркі. У канцы чэрв. 1944 вязні лагера знішчаны ў б. калгасным хляве ў в. Малы Трасцянец (6,5 тыс. чал.). Усяго ў Т.л.с. загублена 206,5 тыс. чал. Па колькасці знішчаных людзей гэты лагер стаіць на 4-м месцы пасля *Асвенціма, Майданака* і Траблінкі (каля 810 тыс. чал.). На месцы загубы вязняў абеліск, за 200 м ад в. Вял. Трасцянец помнік ахвярам фашызму.

Літ.: Памяць: Гіст.-дак. хроніка Мінскага р-на. Мн., 1998. С. 157, 160—161.

ТРАСЦЯНІ́ЦА, група археал. помнікаў каля в. Трасцяніца Камянецкага р-на Брэсцкай вобл. Бескурганны могільнік паморскай культуры (4—2 ст. да н.э.). Даследавала ў 1962 В.Б.Караткевіч. Пахавальны абрад — трупаспаленне. Выяўлены 22 ямы і 2 пахаванні. У адным з іх каменная скрынка, унутры якой гліняны гаршчок з рэшткамі перапаленых касцей 2 нябожчыкаў; каля пахавання — вял. чорная глянцаваная ваза і міска, у якой ляжалі кубак і збан. У другім пахаванні знойдзены перапаленыя косці, абломкі вял. глінянай пасудзіны, жал. раннелатэнская фібула і драцяны пярсцёнак. Курганныя могільнікі дрыгавічоў 11—13 ст. даследавалі ў 1960, 1962 І.В.Біруля, у 1983 і 1987 Т.М.Каробушкіна. Пахавальны абрад — трупапалажэнне галавой на З. Знойдзены фрагменты ганчарнага посуду, 2 цэлыя



Да арт. **Трасцянецкі лагер смерці**. Помнік ахвярам фашызму каля в. Вялікі Трасцянец. 1963.

гаршкі, шыфернае прасліца, залачоныя і рознакаляровыя шкляныя, бронзавыя зярнёныя пацеркі, сярэбраныя і бронзавыя скроневыя кольцы, металічная двухбаковая падвеска, кінжал у скураным футляры з металічным упрыгожаннем, бронзавыя спражкі і інш.

Літ.: Коробушкина Т.Н. Курганы Белорусского Побужья X—XIII вв. Мн., 1993. *В.Б.Караткевіч, Т.М.Каробушкіна.*

ТРАСЦЯНІ́ЦА, Трасцяніцкі канал, рака ў Маларыцкім, Кобрынскім і Жабінкаўскім р-нах Брэсцкай вобл., левы прыток р. Мухавец (бас. р. Зах. Буг). Даўж. 34,3 км. Пл. вадазбору 224 км^2. Пачынаецца за 1,7 км на Пн ад в. Малы Паўлопаль Маларыцкага р-на. Вусце за 2 км на ПнУ ад в. Піліпавічы Жабінкаўскага р-на. Цячэ па Брэсцкім Палессі. Даліна ракі ў сярэднім і ніжнім цячэнні невыразная. Рэчышча, шыр. 6—8 м, каналізаванае.

ТРАСЦЯНІ́ЦА, радовішча пяскоў у Мазырскім р-не Гомельскай вобл., за 1 км на ПнЗ ад в. Стрэльск. Назва ад б.в. Трасцяніца. Лінзападобны паклад звязаны з сучаснымі алювіяльнымі адкладамі поймы р. Прыпяць. Пяскі жаўтаваташэрыя, палевашпатава-кварцавыя, дробназярністыя, з дамешкамі жвіру. Разведаныя запасы 7,4 млн. м^3, перспектыўныя 25,7 млн. м^3. Магутнасць карыснай тоўшчы 5,2—19,2 м, ускрышы (тонказярністыя пяскі, торф) 0,2—6,8 м. Пяскі прыдатныя для вытв-сці сілікатных вырабаў і буд. работ. *А.П.Шчураў.*

ТРА́ТА (італьян. tratta), пераводны *вэксаль*, які аплачваецца пры прад'яўленні. Выстаўляецца самім банкам або ад яго імя. Прыраўноўваецца да наяўных грошай і не можа быць вернуты без аплаты. Часта выкарыстоўваецца ў знешнегандл. аперацыях.

ТРАТЫ́Л, тое, што *трынітраталуол*.

ТРАТЫ́ЛАВЫ ЭКВІВАЛЕ́НТ, энергетычная характарыстыка выбуху ядз. або тэрмаядз. зараду. Лікавае значэнне Т.э. звычайна выражаюць у тонах, кіла- і мегатонах. *Ядзерны выбух* 1 кг урану-235 або плутонію-239 пры поўным дзяленні ўсіх ядзер па колькасці вылучанай энергіі эквівалентны энергіі выбуху 20 кг *трынітраталуолу* (тратылу). Тэрмінам «Т.э.» карыстаюцца таксама для характарыстыкі розных хім. выбуховых сістэм адно́сна тратылу.

ТРА́ЎГУТ Рамуальд Людвікавіч (16.1.1826, в. Шастакова Камянецкага р-на Брэсцкай вобл. — 5.8.1864), адзін з кіраўнікоў *паўстання 1863—64* на Беларусі і ў Польшчы. Вучыўся ў Свіслацкай гімназіі. З 1845 у арміі. Удзельнічаў у падаўленні *рэвалюцыі 1848—49 у Венгрыі, Крымскай вайне 1853—56* (у т.л. ў *Севастопальскай абароне 1854—55*). У 1862 падпалкоўнік у адстаўцы, жыў у маёнтку Востраў Кобрынскага пав. У крас. 1863 узначаліў Кобрынскі паўстанцкі атрад, які ў баях з урадавымі войскамі каля в. Горкі тройчы нанёс ім значныя страты. У чэрв. 1863 разам з Брэсцкім атрадам *Я.Ваньковіча* зрабіў рэйд на Піншчыну і паўн. Валынь. У ліп. 1863 з дапамогай *Э.Ажэшкі* выехаў у Варшаву. У чыне генерала быў прадстаўніком паўстанцкіх улад за мяжой. З кастр. 1863 кіраўнік Нац. ўрада ў Варшаве, фактычна дыктатар паўстання. Шмат зрабіў, каб надаць паўстанню новы размах, пашырыць яго сац. базу, рэарганізаваць паўстанцкія ўзбр. сілы. 30.3.1864 арыштаваны і паводле прыгавору ваен. суда павешаны ў Варшаўскай цытадэлі. У Вял. Айч. вайну ў СССР была створана польская дывізія імя Т. У г. Свіслач Гродзенскай вобл. яму пастаўлены помнік.

Літ.: Миллер И.С. Ромуальд Траугут // За нашу и вашу свободу: Герои 1863 г. М., 1964; Бандарэнка М. Пра Рамуальда Траўгута // Полымя. 1999. №8; Dunin-Wąsowicz K. Romuald Traugutt. Warszawa, 1980. *Г.В.Кісялёў.*



Р.Л.**Траўгут**. Мастак Ф.Ляхновіч. 1998.

ТРАЎЛЕ́ННЕ ў тэхніцы, растварэнне паверхні цвёрдых матэрыялаў у практычных мэтах (у адрозненне ад *карозіі*). Існуе Т. тэхналагічнае (для апрацоўкі і змены формы паверхні металаў, паўправаднікоў, шкла, драўніны і інш.) і структурнае (для выяўлення структуры крышт. матэрыялаў).

Тэхнал. (хім. і электрахім.) выкарыстоўваецца, напр., для ачысткі ад акаліны або атрымання розных паверхняў метал. паўфабрыкатаў, пры луджэнні, пайцы. У тэхналогіі паўправадніковых прылад Т. выкарыстоўваецца для вырабу інтэгральных схем, пячатных плат і інш. Т. робяць на шкле для ўтварэння на ім малюнка або матавай паверхні. Структурнае Т. выкарыстоўваецца для навук. даследаванняў, у прыкладной мінералогіі, прам-сці для кантролю структуры чорных і каляровых металаў і сплаваў, паўправаднікоў, дыэлектрыкаў.

ТРА́ЎЛЕР (англ. trawler ад trawl трал, невад), судна для лоўлі глыбакаводным невадам — тралам рыбы, кальмараў, крэветак і іх першаснай апрацоўкі (раздзелкі, мыцця, замарозкі і інш.); пашыраны тып *рыбапрамысловых суднаў*.

Абсталёўваюцца прамысл. лябёдкамі, грузавымі прыстасаваннямі (парталы, стрэлы), рыбапошукавай апаратурай, прыладамі кантролю за раскрыццём і напаўненнем трала і інш. Адрозніваюць Т. малыя, сярэднія, вялікія і т.зв. супертраўлеры (даўж. ад 15 да 130 м, водазмяшчэнне ад 150 да 10 тыс. т).

ТРА́ЎМА (ад грэч. trauma рана), парушэнне анатамічнай цэласнасці і функцый тканак (органаў) у выніку знешняга ўздзеяння. Вывучае *траўматалогія*. Бываюць Т. мех. (уздзеянне мех. сілы), хім. (уздзеянне к-т, шчолачаў і інш.), тэрмічныя (*апёкі, абмаражэнне*), акустычныя (гукі празмернай сілы), прамянёвыя, баявыя і інш.

Мех. пашкоджанні найб. частыя, бываюць ізаляваныя, множныя, спалучаныя (адначасова ў некалькіх органах). Адрозніваюць Т. вострую (узнікае раптоўна), хранічную (ад уплыву фактараў, што паўтараюцца), закрытую (удар, зрушэнне, *вывіхі*) і адкрытую (*рана*); таксама быт. і вытв., Т. ў час родаў (родавую), чэрапна-мазгавую (агульная назва адкрытых і закрытых Т. чэрапа і галаўнога мозга). Гл. таксама *Траўматызм*.

ТРАЎМАТАЛО́ГІІ І АРТАПЕДЫ́І БЕЛАРУ́СКІ НДІ Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь. Засн. 25.5.1930 у Мінску як Дзярж. ін-т фтызіятрыі, артапедыі і неўралогіі. З 1944 Мінскі НДІ траўматалогіі і артапедыі, з 1945 Мінскі НДІ артапедыі і аднаўленчай хірургіі, з 1957 НДІ траўматалогіі і артапедыі. З 2001 Дзярж. ўстанова Беларускі НДІ траўматалогіі і артапедыі. Асн. кірункі дзейнасці: распрацоўка і ўкараненне новых методык дыягностыкі і лячэння пухлін касцей і суставаў; хворых з пашкоджаннем пазваночніка і спіннога мозга, што суправаджаецца паралічом (парэзам) канечнасцей; хворых з вострай і ўскладненай траўмай і распрацоўка мед. аспектаў траўматызму; дыягностыкі і лячэння суставаў (артраскапія, эндапратэзаванне і інш. рэканструкцыйна-аднаўленчыя аперацыі на суставах); траўматалагічнай і артапедычнай паталогіі ў дзяцей і падлеткаў. У ін-це ў розны час працавалі Б.Н.*Цыпкін*, М.Н.*Шаніра*, Р.Х.*Мініна*; працуюць Я.Дз.*Белаенка* (з 1993 дырэктар), І.Р.*Варановіч*, Л.А.*Пашкевіч*, А.М.*Сакалоўскі* і інш.

ТРАЎМАТАЛО́ГІЯ (ад *траўма* + *...логія*), галіна медыцыны, якая вывучае пашкоджанні апорна-рухальнай сістэмы (*вывіхі, пераломы, расцяжэнні* і інш.), распрацоўвае метады іх дыягностыкі, лячэння і прафілактыкі; найстараж. раздзел медыцыны, аснова *хірургіі*. Цесна звязана з *артапедыяй*. На Беларусі н.-д. работа вядзецца ў НДІ траўматалогіі і артапедыі, Бел. мед. акадэміі пасля-

дыпломнай адукацыі, Мінскім, Віцебскім, Гродзенскім мед. ун-тах, Гомельскім мед. ін-це. Асн. кірункі даследаванняў: прафілактыка вытв., быт., дарожна-трансп. і дзіцячага *траўматызму*, лячэнне ўскладненых, спалучаных і множных пашкоджанняў касцей і суставаў, артраскапічная хірургія, эндапратэзаванне вял. суставаў, лячэнне траўмаў кісці, вострых ускладненых спінальных траўмаў і інш. Уклад у развіццё Т. зрабілі Я.Дз.*Белаенка*, І.Р.*Варановіч*, А.А.*Губко*, А.С.*Крук*, В.А.*Маркс*, Р.Х.*Мініна*, А.У.*Руцкі* і інш.

Літ.: Воронович И.Р., Белоенко Е.Д. Очерки развития ортопедии и травматологии в Республике Беларусь // Мед. новости. 1997. №5. *А.М.Мухля.*

ТРАЎМАТЫ́ЗМ, сукупнасць *траўм* у пэўнай групы насельніцтва пры падобных абставінах, умовах працы і быту ў вызначаны перыяд часу; адна з найважн. сац.-гігіенічных праблем сучаснасці. Вылічаецца колькасцю траўм на 100, 1 тыс. чал. за 1 месяц, год. Адрозніваюць Т. вытв. (прамысл. і с.-г.), невытворчы (быт., аўтадарожны, вулічны, спарт.), дзіцячы, наўмысны, ваенны.

Бывае ад няспраўнага тэхнал. абсталявання, ад ігнаравання правіл тэхнікі бяспекі і дарожнага руху, недастатковага асвятлення, злоўжывання алкаголем і інш. Т. — адна з прычын часовай і ўстойлівай *непрацаздольнасці*. Мерапрыемствы па прадухіленні падзяляюцца на прафілактыку і арганізацыю траўматычнай дапамогі. Вывучае Т. *траўматалогія*.



Траўнік.

ТРА́ЎНІК, чырвананожка (Tringa totanus), птушка роду ўлітаў сям. бакасавых атр. сеўцападобных. Пашыраны ў Еўропе (акрамя Балканскага п-ва) і Азіі. Пералётная. Жыве на балотах, па берагах вадаёмаў. На Беларусі Т.наз. таксама бакасам. Найб. шматлікі на Палессі.

Даўж. да 31 см, маса да 120 г. Апярэнне зверху светла-бурае, знізу белае з чорна-бурымі плямкамі. Задняя палавіна спіны, надхвосце і палоска на крылах белыя. Дзюба прамая, тонкая, чорная, каля асновы чырвоная. Ногі доўгія, аранжава-чырв. (адсюль другая назва). Корміцца пераважна беспазваночнымі. Адкладвае 4 яйцы. Аб'ект палявання.

А.К.Фядосаў.

ТРАФАЛА́КСІС (ад грэч. trophē ежа, жыўленне + грэч. allaxis абмен), абмен кормам і выдзяленнямі залоз паміж асобінамі грамадскіх жывёл (пчол, тэрмітаў, мурашоў). Неабходны для перадачы інфармацыі, кансалідацыі сувязей унутры папуляцыі.

ТРАФАЛЬГА́РСКАЯ БІ́ТВА 1805, адна з вырашальных марскіх бітваў перыяду *напалеонаўскіх войнаў*. Адбылася 21.10.1805 каля мыса Трафальгар (атл. ўзбярэжжа Іспаніі недалёка ад порта Кадыс) паміж англ. (27 лінейных караблёў, камандуючы віцэ-адм. Г.*Нельсан*) і франка-ісп. (18 франц. і 15 ісп. лінкораў, каманд. віцэ-адм. П.Вільнёў) эскадрамі. Франка-ісп. эскадра, заблакіраваная са жн. 1805 у раёне Кадыса караблямі Нельсана, па загадзе Напалеона I 20 кастр. рушыла з гэтага порта, каб без бою выйсці ў Міжземнае мора. Але 21 кастр. пры спробе ўхіліцца ад сутыкнення з праціўнікам павярнула на Пн, яе строй перарэзалі 2 калонамі (15 і 12 караблёў) англ. сілы, якія атакавалі цэнтр і ар'ергард калоны. У ходзе больш чым 5-гадзіннага бою франка-ісп. эскадра страціла 18 караблёў (з іх 17 захоплена) і 7 тыс. чал., англійская — 1700 чал., у т.л. Нельсана (смяротна паранены). Перамога ў гэтай бітве забяспечыла Вялікабрытаніі панаванне на моры і ўскладніла сувязь Францыі з яе калоніямі.

ТРАФАРЭ́Т (ад італьян. trafaretto прадзіраўленае), 1) пласцінка з выразанымі рысункамі, літарамі ці лічбамі, праз якія фарба наносіцца на любую паверхню. Выкарыстоўваецца для арнаментацыі сцен і столей будынкаў, маркіроўкі тары, прамысл. вырабаў і інш. 2) Друкарская форма *трафарэтнага друку*. Пласціна з металу, дрэва, кардону, пластмасы і інш., друкавальныя элементы якой прапускаюць фарбу, а прагальныя — непранікальныя для яе. 3) Прыстасаванне для паскарэння чарцёжна-графічных работ. Пласціна з адтулінамі, выканаая па форме і з памерамі дэталей або іх элементаў, знакаў, умоўных абазначэнняў, схем і г.д., якія паўтараюцца ў чарцяжах. 4) Раз і назаўсёды прыняты ўзор чаго-небудзь, якога слепа прытрымліваюцца; *шаблон*.

ТРАФАРЭ́ТНЫ ДРУК, спосаб друкавання, пры якім адбітак атрымліваюць працісканнем фарбы з дапамогай эластычнага ракеля праз *друкарскую форму* на паперу або іншы матэрыял.

Друкавальныя элементы формы — адкрытыя ўчасткі сеткі, нацягнутай на спец. раму.



Схема **трафарэтнага друку**: 1 — рама для нацягвання друкарскай формы; 2 — друкарская форма; 3 — ракель (нож з металу, гумы або пластмасы); 4 — фарба; 5 — адбітак.

Форму вырабляюць звычайна фотахім. спосабам, друкаванне выконваюць на ручных, паўаўтам. і аўтам. машынах, малафарматных апаратах (*рататарах*). Т.д. дазваляе атрымаць яркія, насычаныя, пры неабходнасці рэльефныя відарысы, якія выкарыстоўваюцца для аддзелкі пераплётных накрывак, афармлення тары і ўпакоўкі, дэкарыравання вырабаў са шкла, керамікі, пластмасы.

ТРАФЕ́І (франц. trophée ад грэч. tropaion літар. — помнік перамогі), 1) помнік у знак перамогі. Першапачаткова ўяўляў сабой слуп з начэпленай на ім зброяй ворага. Да кожнага Т. дадаваўся тэкст, у якім распавядалася пра падрабязнасці бітвы, называліся імёны пераможцаў і пераможаных. Пазней гэтую звычку ў грэкаў перанялі рымляне, якія сталі будаваць помнікі не толькі на месцы перамогі, а ў гарадах дзяржаў-пераможцаў (трыумфальныя аркі, брамы і інш.). 2) Захопленыя ў праціўніка, пакінутыя ім на полі бою або здадзеныя пры капітуляцыі сцягі, ваен. тэхніка і інш. матэрыяльныя каштоўнасці. Т. выкарыстоўваліся войскамі толькі з дазволу вышэйстаячага камандавання і пасля іх праверкі і агляду спецыялістамі трафейнай службы. 3) У перыядычным друку Т. называюць таксама прызы, якія атрымліваюць пераможцы ў спарт. спаборніцтвах. 4) У пераносным значэнні — здабыча як сведчанне поспеху ў якой-н. галіне (напр., паляўнічыя Т. і інш.).

ТРАФІ́МАЎ Альберт Фёдаравіч (25.11.1936, г. Барысаў Мінскай вобл.), бел. вучоны ў галіне жывёлагадоўлі і вет. медыцыны. Д-р вет. н. (1988), праф. (1991). Чл.-кар. Агр. АН Беларусі (1996). Скончыў Віцебскі вет. ін-т (1960). З 1975 у Бел. НДІ жывёлагадоўлі (у 1988—95 заг. аддзела, у 1995—98 нам. дырэктара). Навук. працы па пытаннях інтэнсіўных тэхналогій вытв-сці малака і мяса, сістэм атрымання і выкарыстання цялят; рэканструкцыі жывёлагадоўчых памяшканняў; гігіены ўтрымання буйн. раг. жывёлы.

Тв.: Содержание коров на фермах и комплексах. Мн., 1985 (разам з С.І.Пляшчанкам); Выращивание телок. Мн., 1986 (у саўт.); Получение и выращивание здоровых телят. Мн., 1990 (разам з С.І.Пляшчанкам, В.Ц.Сідаравым); Реконструкция животноводческих помещений. Молодечно, 2001 (у саўт.).

ТРАФІ́МАЎ Пётр Міхайлавіч (7.12.1905, в. Залессе Анежскага р-на Архангельскай вобл., Расія — 13.11.1986), бел. вучоны-эканаміст. Д-р эканам. н. (1963), праф. (1963). Скончыў Архангельскі лесатэхн. ін-т (1933), працаваў у ім у 1933—41, 1946—67 (з 1946 заг. кафедры). У 1967—85 заг. кафедры Бел. тэхнал. ін-та. Навук. працы па праблемах эканам. развіцця, лясной і дрэваапр. вытв-сці, прыродакарыстання.

Тв.: Деревообрабатывающая промышленность Архангельской области. Архангельск, 1954 (разам з М.А.Бяловым); Очерки экономического развития Европейского Севера России. М., 1961; Пути развития лесной промышленности в СССР. Мн., 1972; Социалис-

тическое природопользование. Мн., 1981 (разам з У.С.Раманавым). *У.Р.Залатагораў.*

ТРАФІ́МАЎ Яўсей Рыгоравіч (15.2.1886, в. Хатоўня Рагачоўскага р-на Гомельскай вобл. — 8.1.1970), бел. паліт. дзеяч. З 1901 працаваў у паштова-тэлегр. установах Бабруйска, Гомеля, Міра, Мінска. З 1914 у Адэсе. Удзельнічаў у грамадска-паліт. і культ.-асв. рабоце сярод беларусаў-бежанцаў і салдат Румынскага фронту. З вер. 1919 у Мінску, адзін з лідэраў і чл. ЦК *Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў* (БПС-Р). У 1919—20 заг. інструктарска-арганізац. аддзела Часовага Бел. нац. к-та ў Мінску. Прыхільнік супрацоўніцтва БПС-Р з РКП(б) і КП(б)Б. Як прадстаўнік ЦК БПС-Р, якая выступала за дзярж. цэласнасць Беларусі ў этнагр. межах, адмовіўся падпісаць Дэкларацыю аб 2-м абвяшчэнні ССРБ 31.7.1920, выключаны са складу Ваенна-рэв. к-та БССР. Працаваў у органах спажывецкай і с.-г. кааперацыі, заг. фін. аддзелаў у Мінску. У 1924—30 кіраўнік крэдытна-планавага аддзела Сельсаюзбанка. 12.2.1930 арыштаваны па справе т.зв. «*Саюза вызвалення Беларусі*», паводле пастановы Калегіі АДПУ СССР ад 10.4.1931 высланы ў г. Сарапул (Удмурцкая Рэспубліка, Расія). З 1935 жыў і працаваў у г. Іжэўск, з 1961 у Ленінградзе. Рэабілітаваны ў 1960.

У.М.Міхнюк.

ТРАФІМЕ́НКА Аляксандр Пятровіч (н. 16.9.1950, г. Алматы, Казахстан), бел. філосаф. Д-р філас. н. (1993). Скончыў Казахскі ун-т (1973). З 1979 у Ін-це філасофіі Нац. АН Беларусі. Навук. працы па філас. праблемах касмалогіі, астрафізікі і геафізікі, белых і чорных дзір у Сусвеце, прадказання лакальных і глабальных катастроф.

Тв.: Вселенная и развитие. Мн., 1982; Вселенная: творение или развитие? Мн., 1987; Белые и черные дыры во Вселенной. Мн., 1991; Теория относительности и астрофизическая реальность. Мн., 1992; Черные дыры в физике Земли. Мн., 1997; Black holes in physics of the Earth. Minsk, 1998; Black holes against humankind. Minsk, 1999; Черные дыры против человечества. М., 2000; Черные дыры: «конец света» или путь в бессмертие? // Пришельцы из космоса? Мн., 2002.

ТРАФІ́МЕНКА Сяргей Георгіевіч (22.9.1899, г. Бранск, Расія — 16.10.1953), савецкі военачальнік, генерал-палкоўнік (1944), Герой Сав. Саюза (1944). Скончыў курсы «Выстрал» (1926), ваен. акадэміі імя Фрунзе (1932), Генштаба (1937) і вышэйшыя акад. курсы пры гэтай акадэміі (1949). У Чырв. Арміі з 1919. Удзельнік грамадз. 1918—20 і сав.-фінл. 1939—40 войнаў. У Вял. Айч. вайну камандаваў аператыўнай групай войск і арміямі на Карэльскім, Паўн.-Зах., Сцяпным, Варонежскім, 1-м, 2-м і 3-м Укр. франтах. Пасля вайны камандаваў войскамі ваен. акруг, у 1946—49 — *Беларускай ваеннай акругі.*

ТРАФІМУ́К Андрэй Аляксеевіч (16.8.1911, в. Хветкавічы Жабінкаўскага р-на Брэсцкай вобл. — 1999), расійскі геолаг. Акад. АН СССР (1958, чл.-кар. 1953). Герой Сац. Працы (1944). Скончыў Казанскі ун-т (1933). З 1953 ва Усесаюзным нафтагазавым НДІ (з 1955 дырэктар). З 1957 дырэктар Ін-та геалогіі і геафізікі Сіб. аддз. АН СССР, з 1958 нам. старшыні Сіб. аддз. АН СССР, з 1963 чл. прэзідыума АН СССР. З 1988 саветнік прэзідыума АН СССР. Навук. працы па тэктоніцы і нафтагазаноснасці Волга-Уральскага нафтагазаноснага басейна і нафтагазаноснасці Д. Усходу. Дзярж. прэміі СССР 1946, 1950. Дзярж. прэмія Рас. Федэрацыі 1994.



А.Ф.**Трафімаў**.



А.А.**Трафімук**.



А.Р.**Трафімчук**.

Тв.: Нефтеносность палеозоя Башкирии. М.; Л., 1950; Миграция рассеянных битумоидов. Новосибирск, 1971 (разам з У.С.Вышамірскім, А.Э.Кантаровічам); Геология нефти и газа Западной Сибири. М., 1975 (у сааўт.).

ТРАФІМЧУ́К Алег Рыгоравіч (16.1.1941, Мінск — 18.5.1984), бел. архітэктар. Скончыў БПІ (1968). З 1968 гал. архітэктар г. Маладзечна, з 1971 ва ўпраўленні па буд-ве і архітэктуры Мінскага аблвыканкома (з 1973 нач. упраўлення, гал. архітэктар вобласці). Асн. работы: *Манумент у гонар маці-патрыёткі* ў г. Жодзіна (Дзярж. прэмія СССР 1977), праекты планіроўкі і забудовы 3 мікрараёнаў і праспекта Леніна ў Маладзечне (1969—73), цэнтраў гарадоў Капыль (1972) і Жодзіна (1974—75), мікрараёна ў г. Клецк (1972), генпланы г.п. Мядзел (1973), г. Вілейка (1977), вёсак Крупіца Мінскага (1979), Слабада Смаляўцкага (1980) р-наў (усе ў сааўт.). Помнікі М.Горкаму ў Мінску (1981), Г.А.Нікандравай ў г. Дуброўна (1980), мемар. комплекс у гонар Ветрынскіх падп. райкомаў КП(б)Б і ЛКСМБ, партыз. брыгады імя Варашылава ў в. Гомель Полацкага р-на (1977).

ТРАФІМЧУ́К Мікола (Мікалай Мікалаевіч; н. 3.1.1950, в. Восаўцы Драгічынскага р-на Брэсцкай вобл.), бел. паэт. Скончыў Брэсцкі пед. ін-т (1975). Працаваў у рэдакцыях раённых газет, на Брэсцкім тэлебачанні, у газ. «Мінская праўда», «Звязда», «Наша доля». Друкуецца з 1970. У зб-ках «Трыванне» (1990), «Фэст» (1994), «Любіць Бог Беларусь», «Трын-трава», «Найперш мы — ліцвіны» (усе 1996) асэнсаванне прызначэння чалавека на зямлі, сцвярджэнне духоўных каштоўнасцей.

ТРАФІ́ЧНЫ ЛАНЦУ́Г, ланцуг харчавання, шэраг арганізмаў у *біягеацэнозах*, звязаных паміж сабой адносінамі «корм — спажывец». Асн. тыпы Т.л.: пашавы (у аснове зялёныя расліны; напр., елка—тля—божая кароўка—павук—мухалоўка—яструб; аднаклетачныя водарасці—весланогія рачкі—верхаводка—судак),ідэтрытны (у аснове фітадэтрыт; напр., лісцевы апад дрэў—дажджавы чарвяк—жукістафіліны—землярыйкі—ліс). Арганізмы наступнага звяна (*трафічнага ўзроўню*) паядаюць прадстаўнікоў папярэдняга звяна, т.ч. здзяйсняецца ланцутовы перанос энергіі і рэчыва, які ляжыць у аснове кругавароту рэчываў у прыродзе. У Т.л. пры пераносе патэнцыяльнай энергіі ад звяна да звяна большая яе ч. страчваецца, таму ў Т.л. звычайна не больш як 5 звёнаў. Т.л. ўтвараюць трафічныя сеткі, якія ўзнікаюць у выніку шырокага трафічнага спектра (*поліфагіі*) большасці кансументаў (напр., пацукі жывяцца расл. і жывёльным кармамі, могуць з'яўляцца рознымі трафічнымі ўзроўнямі некалькіх трафічных ланцугоў) і інш. Асн. структурны элемент і ўласцівасць трафічнай сеткі — *экалагічнае дубліраванне*, пры якім у экасістэмах нешматлікі від замяняецца інш., функцыянальна блізкім (напр., буйных капытных жывёл замяняюць грызуны). Вывучае Т.л. *трофаэкалогія.*

ТРАФІ́ЧНЫ ЎЗРО́ВЕНЬ, сукупнасць арганізмаў *біягеацэнозу*, аб'яднаных тыпам жыўлення. Адрозніваюць Т.ў.: *прадуцэнты* (аўтатрофныя арганізмы, пераважна зялёныя расліны), *кансументы* 1-га (расліннаедныя жывёлы), 2-га (драпежнікі) і 3-га (другасныя драпежнікі) парадкаў, *рэдуцэнты* (мікраарганізмы-дэструктары). Арганізмы розных *трафічных ланцугоў*, якія атрымліваюць корм праз аднолькавую колькасць звёнаў, знаходзяцца на адным Т.у. Асобіны аднаго віду, якія прымаюць удзел у розных трафічных ланцугах, могуць знаходзіцца на розных Т.у., у залежнасці ад крыніцы энергіі. На кожным Т.у. корм асімілюецца часткова, значная яго ч. траціцца на абмен, таму прадукцыя арганізмаў кожнага наступнага Т.ў. заўсёды меншая за прадукцыю папярэдняга ў сярэднім у 10 разоў. Адносная колькасць энергіі, што перадаецца ад аднаго Т.ў. да другога, наз. экалагічнай эфектыўнасцю згуртавання. Суадносіны розных Т.у. (трафічную структуру) графіч-

на паказваюць у выглядзе *экалагічнай піраміды*. Вывучае Т.ў. *трофаэкалогія*.

ТРАХАФО́РА (ад грэч. trochos кола + phoros які нясе), л о в е н а ў с к а я л і ч ы н к а, мікраскапічная свабодна плаваючая лічынка *многашчаціпкавых чарвей, сіпункулід, эхіўрыд* і некат. малюскаў. Другая назва ад імя швед. заолага С.Ловена, які апісаў Т. ў 1840. Састаўная ч. планктону. Жывуць у акіянскіх водах.

Цела з адным або некалькімі паяскамі раснічак для перамяшчэння. Стрававальная сістэма складаецца са страўніка, сярэдняй і задняй кішкі. Выдзяляльныя органы — протанефрыдыі. На пярэднім полюсе цела знаходзіцца орган пачуццяў — цемянная пляцінка з султанам раснічак і вял. колькасцю клетак. Пры развіцці Т. многашчаціпкавых чарвей набывае шчаціпкі (параподыі), утвараюцца парныя цэламічныя мяшкі, і лічынка пераходзіць у стадыю метатрахафоры, а ў малюскаў — у велігер. *А.М.Петрыкаў.*



Трахафора многашчаціпкавага чарвяка палігордыус.

ТРАХЕЇДЫ (ад *трахея* + грэч. eidos выгляд), мёртвыя адраўнелыя клеткі раслін, якія праводзяць ваду з растворанымі ў ёй рэчывамі і выконваюць мех. функцыю. Трапляюцца ў *ксілеме* (драўніне) вышэйшых раслін, за выключэннем некат. пакрытанасенных (напр., злакаў, асок). У папарацепадобных і ў большасці голанасенных раслін Т. — адзіныя праводныя элементы драўніны.

Даўж. 0,5—10 мм (агава), дыям. да 0,1 мм. Клеткі замкнёныя, моцна выцягнутыя, звужаныя і завостраныя на канцах, шматвугольныя, з патоўшчанымі сценкамі. Размешчаны верт. радамі, злучаюцца аблямаванымі порамі.

ТРАХЕЇТ, запаленне слізістай абалонкі *трахеі*. Бывае востры і хранічны. В о с т р ы Т. выклікаюць мікраарганізмы (часцей вірусы), пераахаладжэнне і інш.; часта ён спалучаецца з рынітам, фарынгітам, ларынгітам, бранхітам. Х р а н і ч н ы Т. развіваецца з вострага (асабліва пры курэнні). Прыкметы: прыступападобны кашаль (сухі або з макротай), боль у глотцы і за грудзінай, ахрыпласць. Лячэнне тэрапеўт., фізіятэрапеўтычнае.

ТРАХЕЙНАДЫ́ХАЛЬНЫЯ, т р а х е й н ы я, н е п а ў н а в у с ы я (Tracheata, або Atelocerata), падтып наземных або другаснаводных членістаногіх жывёл. Уключае *мнаганожак* і *насякомых*.

Маюць 1 пару вусікаў (2-я пара адсутнічае; адсюль адна з назваў). Дыханне звычайна трахейнае, радзей праз скуру або (у другаснаводных лічынак насякомых) трахейнымі жабрамі — вырастамі сценак цела. У некат. інш. падтыпах (напр., у *хеліцэравых*) таксама ёсць формы з трахейным дыханнем. У покрывах Т. прысутнічаюць воска- і тлушчападобныя рэчывы, якія засцерагаюць арганізм ад высыхання. Большасці Т. уласціва ўнутр. апладненне і наяўнасць т.зв. «тлушчавага цела» — тлушчавай тканкі, якая ўдзельнічае ў водазабеспячэнні арганізма. Функцыя выдзялення ажыццяўляецца праз *мальпігіевыя сасуды* або сценкі кішэчніка. *С.Л.Максімава.*

ТРАХЕ́Я (ад грэч. tracheia artēria дыхальнае горла), д ы х а л ь н а е г о р л а, паветраправодныя трубчасты орган дыхальнай сістэмы пазваночных жывёл і чалавека. Размешчана паміж *гартанню* і *бронхамі* наперадзе стрававода (у некат. земнаводных не адасоблена ад гартані, не падзяляецца на бронхі). У чалавека даўж. Т. 9—11 см, дыям. 15—18 мм. Аснова яе — храстковыя паўкольцы, сценка ўтворана слізістай, падслізістай, фіброзна-храстковай і адвентыцыяльнай абалонкамі.

У падслізістай размешчана вял. колькасць слізістых залоз, якія ўвільгатняюць паветра, тут развіты сасудзістыя спляценні, якія сагравающь паветра. У фіброзна-храстковай абалонцы 16—20 гіялінавых храстковых паўкольцаў, якія аблягчаюць рух ежы па стрававадзе, захоўваюць прасвет Т. Вонкавая абалонка ўтворана рыхлай валакністай злучальнай тканкай, мае крывяносныя сасуды, нервы. Т. наз. таксама паветраносныя дыхальныя трубачкі ў некат. беспазваночных. *А.С.Леанцюк.*

ТРАХІКА́РПУС (Trachycarpus), род кветкавых раслін сям. пальмаў. 8 відаў. Пашыраны ў Паўд.-Усх. Азіі і Гімалаях. Культывуюць холадаўстойлівыя пальмы Т. Форчуна (T.fortunei) і Мартыуса (T.martianus).

Дрэвападобныя расліны выш. да 20 м, ствол дыяметрам да 20 см, укрыты карычнева-бурымі валокнамі, на верхавінцы — пучок вял. веерападобнага лісця (каля 30). Кветкі ў буйных галінастых пазушных суквецці да 1 м. Плод — касцянка. З лісця атрымліваюць валокны для вырабу цыновак, грубых тканін, шчотак і інш. Тэхн. і дэкар. расліны.

ТРАХІЛІ́ДЫ (Trachylida), атрад беспазваночных жывёл кл. гідроідных тыпу кішачнаполасцевых, або жыгучых. 2 падатр.: нарка медузы і трахамедузы. Пашыраны ўсюды ў морах у тоўшчы вады.

Дыяметр ад 1 мм да 10 см. Парасон празрысты, звычайна ярка афарбаваны. Па яго краі ёсць звычайныя і відазмененыя шчупальцы, якія выконваюць ролю гідрастатычных органаў. Размнажэнне палавое. Гл. таксама *Медузы*.

ТРАХІМЁНАК Сяргей Аляксандравіч (н. 7.2.1950, г. Карасук Новасібірскай вобл., Расія), бел. юрыст і пісьменнік. Д-р юрыд. н. (1999). Скончыў Свярдлоўскі юрыд. ін-т (1977), Вышэйшыя курсы КДБ СССР (1981). З 1990 у Ін-це нац. бяспекі Рэспублікі Беларусь (з 1996 нач. кафедры). З 1999 нач. сітуацыйна-аналіт. цэнтра дзяржсакратарыята Савета Бяспекі Рэспублікі Беларусь. З 2000 у Ін-це нац. бяспекі Рэспублікі Беларусь. Навук. працы па праблемах метадалогіі забеспячэння нац. бяспекі. Аўтар вострасюжэтных раманаў і сцэнарыяў хранік.-дакумент. фільмаў.

Тв.: Российский триллер; Игры капризной дамы. М., 1996; Безопасность государства: Методол.-правовые аспекты. Мн., 1997; Груз небесный. Мн., 1998; Заказ на двадцать пятого. М., 1999; Женская логика. Мн., 2000; Второй уровень. Мн., 2001.

ТРАХІ́Т (ад грэч. trachys шурпаты), эфузіўная сярэдняя горная парода, складзеная з мікралітаў і ўкрапанікаў шчолачнага палявога шпату (анартаклазу, санідзіну), плагіяклазу, амфіболу, біятыту ў вулканічным шкле. Колер бе-



Трахікарпус Форчуна.

лы, светла-шэры, жаўтаваты, ружаваты. Шчыльн. 2,5 г/см^3. Структура парфіравая, тэкстура трахітавая са струменістым размяшчэннем крышталёў санідзіну. Эфузіўны аналаг *сіеніту*. Прадукт вывяржэння вулканаў, складае іх патокі, покрывы, купалы, некі і інш. Выкарыстоўваецца ў буд-ве; дэкаратыўны і вырабны камень.

ТРАХО́ІДА, гл. ў арт. *Цыклоіда*.

ТРАХО́МА (грэч. trachōma ад trachys шурпаты, няроўны), хранічнае інфекцыйнае запаленне злучальнай тканкі (кан'юнктывы) вачэй у чалавека. Узбуджальнік — унутрыклетачны паразіт з роду хламідый; заражэнне кантактным шляхам.

Прыкметы: кан'юнктыва чырванее, на ёй утвараюцца шэрыя, мутныя зярняты (фалікулы), памяншаецца сакрэцыя слёзнай вадкасці, рагавіца прарастае сасудамі, утвараюцца рубцы. Ускладненні: зварот краёў павекаў, няправільны рост вее к (*трыхіяз*), запаленне рагавіцы з язвамі, *бяльмом*; адна з прычын *слепаты*. Лячэнне тэрапеўт., хірургічнае.

І.М.Семяненя.

ТРАХТЭНБЕ́РГ Навум Яфімавіч (4.1.1910, г. Бахмач Чарнігаўскай вобл., Украіна — 16.10.1977), бел. архітэктар. Скончыў Адэскі ін-т грамадз. і камунальнага буд-ва (1932). У 1953—56 кіраўнік майстэрні Генплана ў ін-це «Мінскпраект», адначасова ў 1954—76 выкладчык БПІ. Асн. работы (у сааўт.): у Мінску — праект дэталёвай планіроўкі горада (1939), генпланы (1946, карэкціроўкі 1952, 1958; 1965, карэкціроўкі 1969, 1972—73), праект дэталёвай планіроўкі і забудовы цэнтра, праект планіроўкі і забудовы 2-й чаргі Ленінскага праспекта (цяпер *Скарыны праспект*; 1953, Дзярж. прэмія Беларусі 1968); генпланы Бабруйска (1936, 1939), Магілёва (1939), праект забудовы цэнтр. ч. Віцебска (1950). Гал. архітэктар і аўтар схемы планіроўкі прыгараднай зоны Мінска (1964), праекта планіроўкі зоны адпачынку на Заслаўскім вадасховішчы пад Мінскам (1968).

Тв.: Минск: Послевоен. опыт реконструкции и развития. М., 1966 (у сааўт.).

ТРАЦЕ́ЙСКІ СУД, арбітражны суд, суд, які выбіраецца па ўзгодненні бакоў для вырашэння імі спрэчак цывільна-прававога і гасп. характару. У залежнасці ад суб'ектаў спрэчных прававадносін адрозніваюць 2 віды Т.с.: суды для вырашэння спрэчак паміж фіз. асобамі і суды для вырашэння спрэчак паміж юрыд. асобамі. У Рэспубліцы Беларусь трацейскі разбор спрэчак рэгулюецца адпаведна нормамі цывільнага працэсуальнага або гасп. працэсуальнага кодэксаў. Т.с. можа вырашаць любыя спрэчкі паміж грамадзянамі, акрамя тых, што вынікаюць з працоўных і сямейных праваадносін. Дагавор аб перадачы спрэчкі на Т.с. заключаецца ў пісьмовай форме, дзе спрэчныя бакі бяруць на сябе абавязацельства выканаць яго рашэнне. Рашэнне Т.с., не выкананае добраахвотна, можа быць прыведзена ў выкананне прымусова праз адпаведныя тэр. суды. Для трацейскага вырашэння спрэчак паміж удзельнікамі знешнеэканам. дзейнасці юрыд. асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў у Рэспубліцы Беларусь у 1999 створаны міжнар. арбітражны (трацейскі) суд (гл. *Арбітраж міжнародны*).

ТРАЦІ́ЧНАЯ СІСТЭ́МА (ПЕРЫ́ЯД), сістэма кайназойскай эратэмы, якая адпавядае 1-му перыяду кайназойскай эры геал. гісторыі Зямлі. Тэрмін прапанаваны ў 1759 італьян. геолагам Дж.Ардуіна. Выкарыстоўваецца пераважна ў замежнай л-ры. У айчыннай навуцы з 1959 заменена на самаст. *палеагенавую сістэму (перыяд)* і *неагенавую сістэму (перыяд)*.

ТРАЦЦЯ́К Васіль Якаўлевіч (6.12.1926, с. Камароўка Коранеўскага р-на Курскай вобл., Расія — 16.4.1989), украінскі спявак (драм. тэнар). Нар. арт. СССР (1980). Скончыў Харкаўскую кансерваторыю (1958). З 1958 у Малдаўскім, у 1962—88 ва Украінскім т-рах оперы і балета. З 1976 выкладаў у Кіеўскай кансерваторыі. Валодаў моцным голасам шырокага дыяпазону, драм. дараваннем. Яго выкананню былі ўласцівы выдатная дыкцыя, тонкая філіроўка гуку, яскравы тэмперамент. Выконваў партыі ў класічных і сучасных операх: Андрэй («Запарожац за Дунаем» С.Гулак-Арцямоўскага), Васіль («Мілана» Г.Майбарады), Богун («Багдан Хмяльніцкі» К.Данькевіча), Адмірал, Лаўро («Гібель эскадры», «Мамаі» В.Губарэнкі), Андрэй Хаванскі («Хаваншчына» М.Мусаргскага), Герман («Пікавая дама» П.Чайкоўскага), Лыкаў («Царская нявеста» М.Рымскага-Корсакава), Сяргей («Кацярына Ізмайлава» Дз.Шастаковіча), Каніо («Паяцы» Р.Леанкавала), Атэла, Радамес, Рычард («Атэла», «Аіда», «Баль-маскарад» Дж.Вердзі).

ТРАЦЦЯ́К Іван Майсеевіч (н. 20.2.1923, с. Малая Папоўка Харольскага р-на Палтаўскай вобл., Украіна), савецкі ваен. дзеяч. Ген. арміі (1976). Герой Сав. Саюза (1945), Герой Сац. Працы (1982). Скончыў Астраханскае стралкова-кулямётнае вучылішча (1941). Ваен. акадэміі імя Фрунзе (1949) і Генштаба (1959), Вышэйшыя акад. курсы (1970). У Чырв. Арміі з 1939. У Вял. Айч. вайну на Зах. і 2-м Прыбалт. франтах: камандзір роты, батальёна, палка. Пасля вайны на штабных і камандных пасадах. У 1967—76 камандуючы *Беларускай ваеннай акругай*, з 1976 — Далёкаўсх. ваен. акругай. У 1987—91 галоўнакаманд. войскамі ППА — нам. міністра абароны СССР. Канд. у чл. ЦК КПСС з 1971, чл. ЦК КПСС у 1976—91. Чл. ЦК КПБ у 1971—76, Бюро ЦК КПБ у лют.—жн. 1976. Дэп. Вярх. Савета СССР у 1966—89. Аўтар кнігі «Храбрыя сэрцы аднапалчан» (1977). *Б.Дз.Далгатовіч.*

ТРАЦЦЯ́К Станіслаў Іванавіч (7.12.1950, г. Калінінград, Расія), бел. вучоны ў галіне агульнай хірургіі, транспланталогіі. Д-р мед. н. (1996), праф. (1998). Скончыў Мінскі мед. ін-т (1974). З 1977 у Бел. мед. ун-це (з 1994 заг. кафедры). Навук. працы па хірург. метадах лячэння цукр. дыябету і інш. эндакрынных захворванняў, распрацоўцы метадаў дыягностыкі і лячэння захворванняў печані і жоўцевых шляхоў.

Тв.: Необычная реакция на чужеродные ткани. Ч. 1—2. Мн., 1992 (у сааўт.); Комплексная морфометрическая оценка аллотрансплантатов щитовидной железы после пересадки в правое предсердие // Количественная морфология развивающегося организма. Мн., 1998.

ТРАЦЦЯ́К Уладзіслаў Аляксандравіч (н. 25.4.1952, с. Арудзьева Дзмітраўскага р-на Маск. вобл.), расійскі спартсмен (хакей з шайбай). Засл. майстар спорту СССР (1971). Скончыў Маск. ін-т фіз. культуры (1976), Ваенна-паліт. акадэмію. У 1968—84 варатар каманды ЦСКА, з 1970 — зборнай каманды СССР. З 1984 на адм. рабоце. З 1992 трэнер Нац. хакейнай лігі, зборнай каманды Расіі. З 2002 узначальвае Фонд Уладзіслава Траццяка. Чэмпіён XI, XII і XIV зімовых Алімп. гульняў (1972, г. Сапара, Японія; 1976, г. Інсбрук, Аўстрыя; 1984, г. Сараева, Югаславія). Чэмпіён свету (1970, 1971, 1973—75, 1978, 1979, 1981—83), сярэбраны (1972, 1976), бронз. (1977) прызёр. Чэмпіён Еўропы (1970, 1973—75, 1978, 1979, 1981—83), сярэбраны (1971, 1972), бронз. (1976, 1977) прызёр. Чэмпіён СССР (1970—73, 1975, 1977—84).

А.М.Петрыкаў.

ТРАЦЦЯКО́Ў Віктар Віктаравіч (н. 17.10.1946, г. Краснаярск, Расія), расійскі скрыпач. Нар. арт. Расіі (1979). Нар. арт. СССР (1987). Скончыў Маскоўскую кансерваторыю (1970). З 1969 саліст Маскоўскай філармоніі, адначасова з 1983 маст. кіраўнік Камернага аркестра Расіі і выкладае ў Маскоўскай кансерваторыі (з 1989 праф.). Для яго ігры характэрны эмацыянальнасць, маштабнасць, віртуознасць. У рэпертуары скрыпічныя творы І.Брамса, П.Чайкоўскага, Дз.Шастаковіча, С.Пракоф'ева, а таксама канцэрты, санаты, п'есы рас. і замежных кампазітараў. 1-я прэмія на Усесаюзным конкурсе музыкантаў-выканаўцаў (1965, Масква), Міжнар. конкурсе імя Чайкоўскага (1966, Масква). Дзярж. прэмія Расіі імя М.Глінкі 1981.

ТРАЦЦЯКО́Ў Павел Міхайлавіч (27.12.1832, Масква — 16.12.1898), рускі прадпрымальнік, мецэнат, маст. дзеяч. Правадз. чл. Пецярбургскай АМ (1893). Чл. маскоўскага аддзялення Савета гандлю і мануфактур (1868—89), выбарны Маскоўскага біржавога т-ва (з 1870), Рус. муз. т-ва (1860—98), савета Маскоўскага маст. т-ва (1872—94). З 1854 пачаў збіраць маст. калекцыю, з 1856 творы рус. мастацтва, якія паклалі

пачатак заснаванню *Траццякоўскай галерэі*. У 1892 перадаў свой збор у дар Маскве.

ТРАЦЦЯКО́Ў Пётр Мікалаевіч (12.11.1909, г. Кастрама, Расія — 12.6.1976), расійскі археолаг і гісторык. Чл.-кар. АН СССР (1958). Д-р гіст. н. (1945). Скончыў Ленінградскі ун-т (1930). У 1950—53 гал. рэдактар час. «Вопросы истории». З 1951 дырэктар Ін-та славяназнаўства АН СССР, з 1959 у Ленінградскім аддзяленні Ін-та археалогіі АН СССР. Даследаваў праблемы этнагенезу і стараж. гісторыі ўсх. славян, працэс складвання стараж.-рус. народнасці. У 1951 узначаліў Славянскую (Верхнедняпроўскую) экспедыцыю, якая пачала вывучэнне культур ранняга жал. веку і 1-га тыс. н.э. ў Верхнім Падняпроўі. У 1951—53 разам з Ю.У.Кухарэнкам і В.М.Мельнікоўскай адкрыў і абследаваў шэраг помнікаў зарубінецкай і мілаградскай культур на Гомельшчыне. Удзельнічаў у падрыхтоўцы кадраў бел. археолагаў. Дзярж. прэмія СССР 1952.

Тв.: Восточнославянские племена. 2 изд. М., 1953; Раннеславянские поселения и могильники на территории Белоруссии // Краткие сообщения Ин-та археологии. Киев, 1955. Вып. 4; Чаплинское городище // Памятники зарубинецкой культуры. М.; Л., 1959; Финно-угры, балты и славяне на Днепре и Волге. М.; Л., 1966; У истоков древнерусской народности. Л., 1970; По следам древних славянских племен. Л., 1982.

В.С.Вяргей.

ТРАЦЦЯКО́Ў Якаў Адамавіч (23.10.1916, в. Зябраўка Гомельскага р-на — 4.12.1985), поўны кавалер ордэна Славы. У Вял. Айч. вайну з 1941 на фронце. Камандзір процітанк. гарматы старшына Т. вызначыўся пры знішчэнні ўмацаванняў, агнявых кропак і жывой сілы ворага ў баях на тэр. Калінкавіцкага р-на Гомельскай вобл., каля г. Аўгустаў (Польшча) і на подступах да Берліна. Пасля вайны працаваў у сельскай гаспадарцы.

ТРАЦЦЯКО́ЎСКАЯ ГАЛЕРЭ́Я дзяржаўная, найбуйнейшы ў свеце музей рус. выяўл. мастацтва. Засн. ў Маскве ў 1856 П.М.*Траццяковым*, у 1892 перададзена ім у дар гораду. Да 1918 наз. Маскоўская гар. маст. галерэя П. і С. Траццяковых. У музеі багацейшы збор іканапісу ўсіх асн. школ стараж.-рус. мастацтва, у т.л. работы Ф.Грэка, А.Рублёва, Дыянісія, С.Ушакова. Захоўваецца жывапіс і скульптура 18 — 1-й пал. 19 ст. (творы У.Баравікоўскага, К.Брулова, А.Іванава, Дз.Лявіцкага, Ф.Рокатава, В.Трапініна, П.Фядотава, Ф.Шубіна), найб. поўны збор работ *перасоўнікаў*, жывапісцаў і графікаў канца 19 — пач. 20 ст., у т.л. членаў маст. аб'яднанняў «Свет мастацтва», Саюз рус. мастакоў, «Блакітная ружа», «Бубновы валет» і інш. (І.Левітана, М.Урубеля, В.Сярова, В.Барысава-Мусатава, К.Каровіна, М.Рэрыха, А.Бенуа, К.Сомава і інш.). У Т.г. прадстаўлены лепшыя ўзоры шматнац. мастацтва 20 ст., творы майстроў авангарда (В.Кандзінскага, М.Ларыёнава, К.Малевіча, М.Шагала і інш.) і інш. плыней: С.Герасімава, С.Канёнкава, П.Канчалоўскага, П.Корына, В.Мухінай, М.Несцерава, Ю.Піменава, М.Сар'яна і інш. У Т.г. захоўваюцца творы бел. мастакоў З.Азгура, В.Альшэўскага, Г.Асташонка, А.Бархаткова, М.Басалыгі, Г.Вашчанкі, В.Грамыкі, А.Грубэ, Л.Давідзенкі, М.Данцыга, Я.Ждана, Ю.Зайцава, Н.Залознай, Р.Заслонава, У.Зінкевіча, Б.Казакова, А.Кашкурэвіча, А.Кішчанкі, Г.Кобрына, А.Ксяндзова, А.Кузняцова, С.Ларчанкі, А.Лось, Л.Марчанкі, А.Маціевіча, В.Мурашова, А.Мятліцкага, М.Савіцкага, У.Савіча, М.Селешчука, У.Слабодчыкава, А.Фінскага, Л.Хобатава, В.Цвіркі, А.Шатэрніка, Г.Шутава, Л.Шчамялёва.

У Т.г. захоўваецца больш за 50 тыс. твораў мастацтва. У аддзеле рукапісаў (з 1922) — больш за 200 тыс. дакументаў па гісторыі рас. маст. культуры



Траццякоўская галерэя. Галоўны фасад.

18—20 ст., асабістыя фонды мастакоў і мастацтвазнаўцаў. Музей рэгулярна праводзіць выстаўкі. Галерэя размешчана ў неаднаразова перабудаваным доме Траццяковых і шэрагу прылеглых да яго будынкаў. Гал. фасад узведзены ў 1900—05 паводле праекта В.Васняцова. У 1936 завершана 8-зальная прыбудова ў неарус. стылі (арх. А.Шчусеў). У 1982—96 праведзена генеральная рэканструкцыя: прыбудаваны дэпазітарый (сховішча), інжынерны корпус, перакрыты ўнутр. двары (арх. Г.Астаф'еў, Б.Клімаў, І.Вінаградскі і інш.). У 1986 музею перадзены будынак Дзяржк. карціннай галерэі. У комплекс Т.г. ўваходзяць таксама царква Міколы Цудатворца ў Талмачах, на правах аддзелаў філіялаў — музеі-кватэры А.Васняцова і Корына, Дом-музей В.Васняцова, Музей-майстэрня Г.Галубкінай.

Літ.: Государственная Третьяковская галерея: Очерки истории, 1856—1917. Л., 1981; Государственная Третьяковская галерея: История и коллекции. 4 изд. М., 1989.

С.У.Пешын.

ТРАЯ́К, найбольш пашыраная назва манеты наміналам у тры *грошы* ў пісьмовых крыніцах Беларусі, Украіны і Польшчы ў 17—18 ст. Упершыню выпушчаны ў 1528 у Кракаве і Торуні (Польшча). Чаканіліся сярэбраныя, білонныя і медныя манеты. На Беларусі шырока абарачаліся ў 16—17 ст. У 1765—94 выпускаліся медныя Т. ў Рэчы Паспалітай.

ТРАЯ́Н Марк Ульпій (Marcus Ulpius Traianus; 18.9.53, Італіка, Іспанія — 7.8.117), рымскі імператар [98—117] з дынастыі *Антанінаў*. Ваен. трыбун, потым намеснік (у 97) правінцыі Верхняя Германія. Пры ім Рым. імперыя дасягнула сваіх максімальных межаў. У выніку войнаў 101—102 і 105—106 заваяваны *Дакія*, у 106 — *Набатэйская дзяржава*. Вынікам усх. паходу 114—117 стала далучэнне Вял. Арменіі і ўсёй *Месапатаміі*. Т. карыстаўся падтрымкай сената, шляхам пазык імкнуўся стрымаць разарэнне дробных і сярэдніх землеўладальнікаў, даваў правінцыялам правы рым. грамадзянства, пашыраў сістэму *аліментацыі*. Пры Т. шырока вялося будаўніцтва ў Рыме і правінцыях (*Траянава калона*, рэшткі *траянавых валоў* ва Усх. Еўропе).



Траян.

Літ.: Федорова Е.В. Императорский Рим в лицах. 2 изд. Смоленск, 1995.

А.Г.Зельскі.

ТРАЯ́Н Надзея Віктараўна (н. 24.10.1921, г. Верхнядзвінск Віцебскай вобл.), Герой Сав. Саюза (1943). Канд. мед. н. (1962). Скончыла 1-ы Маскоўскі мед. ін-т (1947). З пач. Вял. Айч. вайны на падп. рабоце ў Смалявічах, адна са стваральнікаў падп. камсамольскай арг-цыі, потым разведчыца партыз. брыгады «Дзядзькі Колі». Удзельніца падрыхтоўкі забойства ген. камісара Беларусі гаўляйтэра В.*Кубэ*. Пасля вайны выкладчык ВНУ, дырэктар Усесаюзнага НДІ сан. асветы СССР, старшыня выканкома сав. Чырв. Крыжа, прарэктар 1-га Маскоўскага мед. ін-та.

ТРАЯ́Н Юрый Антонавіч (н. 6.10.1950, Мінск), бел. артыст балета. Нар. арт. Беларусі (1979). Скончыў Бел. харэагр. вучылішча (1968). З 1968 артыст, з 1990 нам. дырэктара Нац. акад. т-ра балета Беларусі. У 1988—89 дырэктар Бел. харэагр. вучылішча. Яму ўласцівы арган. спалучэнне класічнага танца з глыбокім пранікненнем у вобраз, індывідуальнасць трактоўкі. Для танца Т. характэрна свабода, скульптурнасць, завершанасць формы. Рознабаковасць яго даравання выявілася ў балетах з сучаснай пластыкай. Сярод партый: Юнак («Пасля балю» Г.Вагнера), Машэка, Тыль («Выбранніца», «Тыль Уленшпігель»

Я.Глебава), Зігфрыд, Дэзірэ, Прынц («Лебядзінае возера», «Спячая прыгажуня», «Шчаўкунок» П.Чайкоўскага), Рамэо, Прынц («Рамэо і Джульета», «Папялушка» С.Пракоф'ева), Хазэ («Кармэн-сюіта» Ж.Бізэ — Р.Шчадрына), Жан дэ Брыен («Раймонда» А.Глазунова), Альберт («Жызэль» А.Адана), Адам («Стварэнне свету» А.Пятрова), Спартак («Спартак» А.Хачатурана), Вацлаў («Бахчысарайскі фантан» Б.Асаф'ева), Джэймс («Сільфіда» Х.Левенскольда), Паэт («Кармінa Бурана» на муз. К.Орфа), партыя ў



Н.В.**Траян**.



Ю.А.**Траян**.



Ю.**Траян**. Рускі танец з балета «Шчаўкунок».

1-актовым балеце «Адажыета» на муз. Г.Малера.

Літ.: Чурко Ю.М. Белорусский балет в лицах. Мн., 1988. С. 91—103; Мушинская Т.М. Гармония дуэта. Мн., 1987.

А.І.Калядзенка.

ТРАЯ́НАВА КАЛО́НА, узведзена імператарам *Траянам* у Рыме ў 111—114. Архітэктар — грэк Апалодор з Дамаска. Мармуровае збудаванне вышынёй 38 м складаецца з кубічнага цокаля, базы і ствала калоны з капітэллю рымска-дарычнага ордэра. Першапачаткова Т.к. была ўвенчана бронзавым арлом, пазней — статуяй Траяна, з 1587 — статуяй апостала Пятра. Ствол Т.к. пакрываюць размешчаныя па спіралі выкананыя з вял. майстэрствам рэльефы (агульная даўжыня 200 м, вышыня 1 м), якія адлюстроўваюць вайну Траяна з *дакамі*. Т.к. — каштоўная крыніца звестак па гісторыі побыту і ваен. тэхнікі рымлян і дакаў; на ёй паказаны каля 2500 чал.

ТРАЯ́НАВЫ ВАЛЫ́, старажытныя абарончыя збудаванні на Пд лесастэпавай часткі Усх. Еўропы. Назва ад імя рым. імператара *Траяна*, заваёўніка *Дакіі*. Частка Т.в. захавалася да нашага часу на тэр. Украіны (Вінніцкая, Хмяльніцкая, Цярнопальская вобл.) і Малдовы. Археал.





Да арт. **Траянава калона**. Агульны выгляд і фрагмент рэльефаў.

даследаванні Ніжняга Малдаўскага вала паказалі, што ён насыпаны рымлянамі на мяжы 1 і 2 ст. н.э. У 3—4 ст. мясц. плямёны выкарыстоўвалі гэты вал супраць рымлян, для чаго з паўн. боку вала роў засыпаны, а з паўд. боку выкапаны. У Падняпроўі валы, падобныя да Т.в., наз. Зміевымі валамі.

ТРАЯ́НАЎКА, вёска ў Барысаўскім р-не Мінскай вобл., на аўтадарозе Халопенічы—Майсееўшчына. Цэнтр сельсавета і саўгаса. За 46 км на ПнУ ад г. Барысаў, 122 км ад Мінска, 36 км ад чыг. ст. Крупкі. 424 ж., 144 двары (2002). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ТРАЯНО́ЎСКІ Алесь (Аляксандр Пятровіч; н. 22.9.1925, урочышча Уздымач, Слуцкі р-н Мінскай вобл.), бел. перакладчык. Скончыў Маскоўскі гіст.-архіўны ін-т (1959). З 1955 у газетах, у т.л. ў 1962—82 у газ. «Звязда», у 1983—86 нам. гал. рэдактара час. «Мастацтва Беларусі». Друкуецца з 1955. Перакладае з чэш. (нар. казкі), верхня- і ніжнялужыцкай (адзін з укладальнікаў і перакладчыкаў, аўтар прадмовы і каментарыяў да анталогіі паэзіі лужыцкіх сербаў «Там, дзе Шпрэвя шуміць», 1969; аповесць-казка Ю.Брэзана «Чорны млын», 1984; аповесць К.Краўца «Малька і сабака Люі», 1991; творы Я.Барт-Цішынскага, К.Лоранца, М.Наўкі і інш.), кашубскай (зб. «За далягляда край Сталемаў», 1980), польскай (творы Я.Асэнкі, Ф.Дарэцкага і інш.), укр. (І.Франко, П.Тычына, А.Алесь і інш.) і інш. моў. Аўтар вершаў, літ.-крытычных артыкулаў і рэцэнзій, публіцыст. артыкулаў.

Літ.: Рагойша В. Адкрыццё паэтычнай выспы // Рагойша В.Кантакты. Мн., 1982.

І.У.Саламевіч.

ТРАЯ́НСКАЯ ВАЙНА́, вайна кааліцыі ахейскіх цароў на чале з царом Мікенаў Агамемнанам супраць *Троі*. Археал. раскопкі пацвердзілі, што каля сярэдзіны 13 ст. да н.э. Троя была разбурана. У стараж. гістарыяграфіі Т.в. датуецца 1280—1270 да н.э. (*Герадот*) ці 1194—1184 да н.э. (*Эратасфен*), у археалогіі каля 1260—1200 да н.э. Паводле паданняў падставай для вайны стала выкраданне траянскім царэвічам *Парысам* жонкі спартанскага цара Менелая Алены. Менелай і яго брат Агамемнан з вял. флотам адплылі ў Трааду (ПнЗ Малой Азіі). Аблога Троі цягнулася 10 гадоў. Горад быў узяты дзякуючы кемлівасці *Адысея* (гл. *Траянскі конь*). Т.в. была адным з этапаў пранікнення грэкаў у М.Азію, якое ўзмацнілася ў 13 ст. да н.э., асабліва пасля выцяснення дарыйцамі ахейцаў з тэр. Грэцыі. Падзеі Т.в. знайшлі адлюстраванне ў паэмах «*Ілія-да*», «*Адысея*» і шэрагу інш. твораў.

Літ.: Кравчук А. Троянская война: Пер. с пол. М., 1991; Флоренсов Н.А. Троянская война и поэмы Гомера. М., 1991; Гиндин Л.А., Цымбурский В.Л. Гомер и история Восточного Средиземноморья.



1



2

Да арт. **Траянская вайна**. Падзенне Троі. Фрагменты размалёўкі: чырвонафігурнай кілікі (1), каля 490 да н.э., чырвонафігурнай гідрыі (2), каля 480 да н.э.

М., 1996; Гринчик Е. Троянская война. Мн., 1998. *А.Г.Зельскі.*

ТРАЯ́НСКІ КОНЬ, у старажытнагрэчаскай міфалогіі вялізны драўляны конь (падарунак багіні *Афіне* і траянцам) са схаванымі ўнутры воінамі, з дапамогай якога грэкі (данайцы і інш.) у канцы *Траянскай вайны* захапілі Трою (таксама гл. ў арт. *Данайцаў дары*). У пераносным сэнсе «Т.к.» — падарунак ворагу з мэтай яго знішчэння, каварны падман. *А.Г.Зельскі.*

ТРАЯ́НЦЫ ў астраноміі, 2 групы *малых планет*, якія абарачаюцца вакол Сонца па арбітах, амаль ідэнтычных арбіце *Юпітэра*; вуглавыя адлегласці ад яго ± 60°.

Вядомы 1084 Т. (2002; названы імёнамі герояў Траянскай вайны). Тых з Т., што апярэджваюць Юпітэр, часам наз. Грэкамі. Найб. з Т. — астэроід Патрокл (дыяметр 272 км; адкрыты ў 1906); самыя яркія — Гектар, Агамемнан, Адысей. Т. канцэнтруюцца паблізу 2 пунктаў, кожны з якіх ўтварае разам з Юпітэрам і Сонцам роўнастаронні трохвугольнік. Рух кожнага з Т. прыблізна адпавядае частковаму выпадку *трох цел задачы* (т.зв. выпадак Лагранжа). *А.А.Шымбалёў.*

ТРАЯНЧУ́К Ігар Алегавіч (н. 27.11.1956, г. Палтава, Украіна), бел. вучоны ў галіне фізікі цвёрдага цела. Д-р фіз.-матэм. н. (1991). Скончыў БДУ (1979). З 1979 у Ін-це фізікі цвёрдага цела і паўправаднікоў Нац. АН Беларусі (з 1995 заг. лабараторыі). Навук. працы па атрыманні новых магн. матэрыялаў на аснове аксідаў пераходных элементаў, даследаванні іх магн. структуры, высвятленні прыроды ўзаемасувязі магн. стану і электраправоднасці.

Тв.: Исследование магнитных фазовых превращений в системе $Nd_{1-x}Ba_xMnO_{3-\delta}$ ($0 \le x \le 0,5$) в зависимости от условий получения (у сааўт.) // Журн. эксперимент. и теорет. физики. 2002. Т. 121, вып. 2.

ТРАЯПО́ЛЬСКІ Гаўрыіл Мікалаевіч (29.11.1905, с. Наваспасаўка Грыбанаўскага р-на Варонежскай вобл. — 30.6.1995), рускі пісьменнік. Працаваў настаўнікам, аграномам. Друкаваўся з 1937. Аўтар цыкла сатыр. апавяданняў «З запісак агранома» (1953; кінасцэнарый «Зямля і людзі», паст. 1956), аповесцей «Кандыдат навук» (1958), «У чароце» (1963), рамана «Чарназём» (кн. 1—2, 1958—61). У драм. аповесці «Белы Бім Чорнае вуха» (1971; Дзярж. прэмія СССР 1975, аднайм. кінафільм 1977) тэмы процістаяння злу ў розных яго праяўленнях, спачування і жорсткасці ў паўсядзённасці, абароны ўсяго жывога. Пісаў п'есы («Пастаяльцы», 1971). У публіцыстыцы — папярэджанне аб пагрозе экалаг. катастроф. На бел. мову паасобныя творы Т. пераклалі Я.Брыль і А.Жук.

Тв.: Соч. Т. 1—3. Воронеж, 1977—78; Бел. пер. — Белы Бім Чорнае вуха. Мн., 1987.

Літ.: Скобелев В. Г.Троепольский. М., 1969. *Л.В.Календа.*

ТРДАТ, Тырыдат, Тырдат, армянскі архітэктар; заснавальнік маст. школы арм. дойлідства 10—11 ст. Прыдворны архітэктар дынастыі Багратыдаў. Творы Т. адметныя дасканаласцю арачна-скляпеністых канструкцый, гарманічнай яснасцю прасторавых кампазіцый, лаканічнай выразнасцю разнога дэкору: кафедральныя саборы ў Аргіне (977—988) і Ані (989—1001), царква Грыгорыя ў Ані (Гагікашэн; 1001—10, 3-ярусная ратонда). Рэстаўрыраваў купал храма св. Сафіі ў Канстанцінопалі (989—92).

Літ.: Оганесян К.Л. Зодчий Трдат. Ереван, 1951.

ТРНКА (Trnka) Іржы (24.2.1912, г. Пльзень, Чэхія — 30.12.1969), чэшскі рэжысёр-мультыплікатар, мастак. Нар. арт. Чэхіі (1963). Творчую дзейнасць пачаў у 1928 у т-ры лялек. У 1941—45 мастак у Нац. т-ры ў Празе. Заснавальнік нац. школы лялечнай мультыплікацыі, дзіцячай маст. кінематаграфіі. Сярод фільмаў: «Жывёлы і разбойнікі» [1946, прыз Міжнар. кінафестывалю (Мкф) у Канах, Францыя], «Шпалічак» (1947, прыз Мкф у Венецыі, Італія), «Салавей імператара» паводле Х.К.Андэрсена (1948), «Прынц Баяя» паводле Б.Немцавай (1950, прызы Мкф у Карлавых Варах, Чэхія; Лакарна, Швейцарыя), «Старадаўнія чэшскія сказанні» паводле А.Ірасека (1953, прыз Мкф у Венецыі), «Прыгоды бравага салдата Швейка» паводле Я.Гашака (1955), «Сон у летнюю ноч» паводле У.Шэкспіра (1959, гал. прыз Мкф у Канах,



Пабудова **траянскага каня**. Карціна Дж.Цьепала. 1757—62.

прыз Мкф у Венецыі), «Страсць» (1961, гал. прыз Мкф у Обергаўзене, Германія), «Кібернетычная бабуля» (1962) і інш. Ілюстраваў кнігі для дзяцей. Дзярж. прэмія Чэхаславакіі 1954.

ТРОГ (ад ням. Trog літар. — карыта), горная даліна, апрацаваная ледавіком. У папярочным сячэнні Т. звычайна маюць ∪-падобную або карытападобную форму з шырокім пакатаўвагнутым дном, схілы амаль вертыкальныя, вышэй пераходзяць у слаба нахіленыя да даліны пляцоўкі (плечы Т.). На схілах і плячах шмат слядоў уздзеяння ледавіка, на дне — марэнныя адклады. Падоўжны профіль няроўны, трапляюцца бар'еры (рыгелі), уступы і інш. Пашыраны ў горна-ледавіковых раёнах сушы.



Папярочны разрэз **трога**. *Т* — дно трога; *а — а* — плечы трога; *в — в* — узровень, да якога даліна была запоўнена лёдам.

ТРОІЦА-СЕ́РГІЕВА ЛА́ЎРА, архітэктурны ансамбль 15—19 ст. у г. *Сергіеў Пасад* (Маскоўская вобл.); адзін з буйнейшых рас. манастыроў. Засн. ў сярэдзіне 14 ст. манахам *Сергіем Раданежскім*, з 1744 лаўра. Манастыр адыграў важную ролю ў станаўленні незалежнай рус. дзяржавы: удзельнічаў у падрыхтоўцы Кулікоўскай бітвы, у барацьбе з войскамі Лжэдзмітрыя II у 1608—10. У 14—17 ст. тут вяліся летапіс, перапіска, ствараліся кнігі, развіваліся іканапіс, маст. рамёствы. У 15—18 ст. склаўся маляўнічы ансамбль, які ўключае больш за 50 будынкаў работы маскоўскіх, пскоўскіх і яраслаўскіх майстроў. Цэнтр ансамбля — 1-купальны 3-апсідны 4-слуповы Троіцкі сабор (1422—23); у інтэр'еры іканастас пач. 15 ст. на 40 абразоў, большасць з якіх выканана пад кіраўніцтвам і з удзелам А.*Рублёва*, Данііла Чорным. У саборы знаходзіцца ра́ка з мошчамі Сергія Раданежскага. Сярод інш. помнікаў: цэрквы Духаўская (1476; над барабанам купала — званіца на слупах), Пятніцкая, Увядзенская (абедзве 1547), 5-купальная надбрамная Іаана Прадцечы (1699), Міхееўская (1734), Смаленская (1745—48, барока); 2-павярховыя шпітальныя палаты з шатровай царквой Засімы і Савація (1635—38), багата дэкарыраваная разьбой трапезная з царквой Сергія (1686—92, т.зв. нарышкінскі стыль), карпусы манастырскіх келляў (17—19 ст.) і інш. Вылучаецца манум. Успенскі сабор (1559—85) — 6-слуповы 5-купальны храм, да якога прылягае шатровая каменная палатка (1780) — пахавальня Барыса Гадунова і яго сям'і. Значнае збудаванне ансамбля — 5-ярусная званіца (1740—70, арх. І.Шумахер, І.Мічурын, Дз.Ухтамскі, барока; выш. 88 м, каля 50 званоў) з гадзіннікам. У 16 ст. ўзведзена крапасная сцяна з 12 вежамі (1540—50, умацавана ў 17 ст.; выш. 10—14 м). У 1918 манастыр закрыты, зноў адкрыты пасля 1944. З 1920 гіст.-маст. музей, з 1940 музей-запаведнік. У зборы музея буйныя калекцыі стараж.-рус. жывапісу і дэкар.-прыкладнога мастацтва 14—17 ст., рус. нар. мастацтва 17 — пач. 20 ст. і інш. Сістэматычна праводзяцца рэстаўрацыйныя работы. На тэр. лаўры — Маскоўская духоўная акадэмія і духоўная семінарыя. Ансамбль Т.-С.л. ўключаны ЮНЕСКА у спіс *Сусветнай спадчыны*.

Літ.: Балдин В. Архитектурный ансамбль Троице-Сергиевой лавры. М., 1976.

Г.А.Лаўрэцкі.



Троіца-Сергіева лаўра.

ТРО́ІЦКАЯ Марына Дзмітрыеўна (22.12.1913, Мінск — 1990), бел. рэжысёр радыё. Засл. дз. культ. Беларусі (1971). Скончыла драм. курсы ў Мінску (1931). З 1931 актрыса Вандроўнага т-ра імя Дзяржынскага, з 1932 Бел. т-ра імя Я.Купалы, у 1949—74 на Рэсп. радыё (з 1964 гал. рэжысёр). Аўтар літ. і муз. кампазіцый, запісаў майстроў бел. сцэны, віктарын, больш за 30 радыёпастановак, у т.л. па творах бел. пісьменнікаў: «Зорка Венера» Б.Бур'яна і І.Нісневіча (1960), «Збянтэжаны Саўка» Л.Родзевіча (1963), «Навальніца над полем» («Людзі на балоце») І.Мележа і «Бацькаўшчына» К.Чорнага (1966), «Сэрца на далоні» І.Шамякіна (1967), «Вяртанне ў маладосць» («Гарадок Устронь», «На парозе будучыні») М.Лобана (1968), «Круты бераг ракі» В.Быкава (1973), «Новая зямля» Я.Коласа (1976) і інш.

А.В.Усцінава.

ТРО́ІЦКІ Мікалай Аляксандравіч (3.4.1927, г. Таржок Цвярской вобл., Расія — 18.5.1999), бел. вучоны ў галіне генетыкі мікраарганізмаў. Д-р біял. н. (1970), праф. (1972). Скончыў Маскоўскі зоавет. ін-т (1948). З 1957 у Бел. н.-д. вет. ін-це, з 1959 у Ін-це генетыкі і цыталогіі Нац. АН Беларусі (у 1965—99 заг. лабараторыі). Навук. працы па пытаннях генет. эфектыўнасці прамежкавых нейтронаў, генет. інжынерыі азотфіксавальных мікраарганізмаў.

Тв.: Генетические эффекты промежуточных нейтронов. Мн., 1971 (разам з М.В.Турбіным, М.А.Арсеньевай); Конъюгация бактерий. Мн., 1978 (разам з С.Я.Драмашкам, К.М.Якавенка); Генетическая инженерия. Мн., 1980 (разам з М.А.Картэлем).

ТРО́ЙЦА, 1) у старажытных рэлігіях тры найб. шанаваныя божаствы, якія знаходзяцца ў цеснай узаемасувязі, але выконваюць розныя функцыі: *Асірыс, Ісіда* і *Гор* у Стараж. Егіпце; *Брахма, Вішну* і *Шыва* ў індуізме; Ану, Эа і *Бэл* у Вавілоне; 2) Адзін з асн. догматаў хрысціянства, паводле якога Бог адзіны па сваёй сутнасці, але існуе ў трох іпастасях — Бог-Айцец, Бог-Сын, Бог-Дух Святы (гл. *Святая Тройца*); 3) Адно з *дванадзесятых свят*, якое ўстаноўлена ў гонар сашэсця Святога Духа на апосталаў у пяцідзесяты дзень (праз 7 тыдняў) пасля ўваскрэсення Хрыста — *Вялікадня* (гл. *Сёмуха*).

ТРО́ЙЦА, вёска ў Шклоўскім р-не Магілёўскай вобл., на р. Бярозаўка. Цэнтр Старасельскага с/с і калгаса. За 15 км на ПнЗ ад горада і 13 км ад чыг. ст. Шклоў, 45 км ад Магілёва. 111 ж., 49 двароў (2002). Пач. школа.

ТРО́КЕНІКІ, вёска ў Астравецкім р-не Гродзенскай вобл., каля аўтадарогі Вільнюс—Полацк. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 25 км на Пн ад г.п. Астравец, 275 км ад Гродна, 30 км ад чыг. ст. Гудагай. 292 ж., 97 двароў (2002). Базавая школа, Дом культуры, б-ка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Помнік архітэктуры — сядзіба (2-я пал. 19 ст. — пач. 20 ст.).

ТРО́КІ (Troki), афіцыйная назва г. *Тракай* да кастр. 1939.

ТРО́КСКАЕ ВАЯВО́ДСТВА, адм.-тэр. адзінка ў ВКЛ у 1413—1795. Цэнтр — г. *Трокі*. Утворана на тэр. Троксказа княства і *Гарадзенскага княства* пасля заключэння *Гарадзельскай уніі 1413*. Былі ўведзены пасады троксказ ваяводы і кашталяна, якія па значэнні лічыліся другімі пасля пасад ваяводы і кашталяна віленскіх. У склад Т.в. ў 15 ст. ўваходзілі паўн., цэнтр. і паўд. часткі Літвы, прынёманскія землі Беларусі, *Берасцейская зямля*, Новагародская зямля, *Падляшша, Кобрынскае княства, Пінскае княства, Давыд-Гарадоцкае княства, Тураўскае княства*. Гэтыя княствы, Берасцейская, Новагародская землі, Падляшша і Ковенскі павет мелі самастойнае ад ваяводы кіраванне. На У Беларусі ў Т.в. ўваходзіла палова *Бабруйскай воласці*. Пасля ўтварэння ў 16 ст. Навагрудскага, Падляшскага і Брэсцкага ваяводстваў тэр. Т.в. значна паменшылася. У 16—18 ст. у Т.в. ўваходзілі Троксі, Ковенскі, Упіцкі пав., *Гродзенскі павет*. Пасля Люблінскай уніі 1569 ваявода і кашталян троксія засядалі ў Сенаце Рэчы Паспалітай. Паводле перапісу 1775 на тэр. Т.в. было 55 614 «дымоў». Паводле пастановы Гродзенскага сойма 1793 Гродзенскі пав. і створаны ў 1791 Мерацкі пав. пераўтворены ў *Гродзенскае ваяводства*. Пасля 3-га падзелу Рэчы Паспалітай указам Кацярыны II ад 25.12.1795 асн. частка Т.в. ўвайшла ў склад Віленскай губ., рэшта — у Слонімскую губ.

А.П.Грыцкевіч.

ТРО́ЛІ, у германаскандынаўскай міфалогіі волаты, якія жывуць унутры гор, дзе захоўваюць свае скарбы. Яны неверагодна моцныя, але выродлівыя і дурныя. У адрозненне ад міфалагічных праціўнікаў багоў — ётунаў Т. шкодзяць людзям, крадуць іх жывёлу, нават займаюцца людаедствам. У больш позніх міфах Т. асацыяваліся з рознымі дэманічнымі істотамі, у т.л. з гномамі.

ТРОМБ (франц. trombe ад італьян. tromba смерч, літар. — труба), у м е т э а р а л о г і і, моцны віхор над сушай, які ўзнікае пад навальнічным воблакам. Дыяметр некалькі дзесяткаў метраў, скорасць ветру да 50—100 м/с (паласа разбурэнняў — некалькі соцень метраў у шырыню). Узнікае ў гарачае надвор'е пры рэзкай няўстойлівай стратыфікацыі атмасферы. У ЗША наз. *тарнада*. Гл. таксама *Віхор, Смерч*.

ТРОМБ (ад грэч. thrombos камяк, згустак) у м е д ы ц ы н е, згустак крыві, які ўтвараецца ў прасвеце крывяноснага (лімфатычнага) сасуда або поласці сэрца; вядзе да *трамбозаў*. Складаецца з *фібрыну*, форменных элементаў крыві.

Адрозніваюць Т. прысценачны і закупорвальны прасвет сасуда; белы, чырв., слаісты, гіялінавы. Белы Т. мае шмат лейкацытаў, утвараецца пераважна ў артэрыях. У чырв. вял. колькасць эрытрацытаў, утвараецца часцей у венах. Гіялінавы Т. утрымлівае разбураныя эрытрацыты, трамбацыты і бялкі плазмы крыві. Часцей бывае змешаны (слаісты) Т., складаецца з галоўкі, прымацаванай да сценкі сасуда, цела і хваста. Можа растварацца, замяшчацца злучальнай тканкай, насычацца солямі кальцыю (утвараецца камень).

І.М.Семяненя.

ТРОМБАФЛЕБІ́Т (ад *тромб* + *флебіт*), запаленне і *трамбоз* вен. Звычайна развіваецца ў сасудах ніжніх канечнасцей, таза, гемараідальных венах. Адрозніваюць востры, хранічны, мігравальны (запаленчы працэс перамяшчаецца з аднаго ўчастка на другі). Сімптомы: боль, павышаная т-ра цела, пачырваненне ці сінюшнасць скуры, ацёк, расшырэнне падскурных вен. Ускладненні вострага Т. — *тромбаэмбалія* лёгачнай артэрыі, гангрэна канечнасцей, абсцэсы і інш. Лячэнне тэрапеўт., хірургічнае.

І.М.Семяненя.

ТРОМБАЭМБАЛІ́Я (ад *тромб* + *эмбалія*), вострая закупорка крывяносных сасудаў (звычайна артэрый) *трombамі*, якія трапілі ў кроваток. Часам прыводзіць да развіцця ішэмічнага інсульту, інфаркту лёгкіх, нырак і інш. Т. складае 99% усіх відаў эмбалій.

ТРОМП (франц. trompe ад старажытнаверхненям. trumba труба) у а р х і т э к т у р ы, трохвугольная нішападобная скляпеністая канструкцыя ў форме ч. конуса, палавіны або чвэрці сферычнага купала. Т. служаць для пераходу ад ніжняй, квадратнай у плане ч. будынка да верхняй, круглай ці шматвугольнай (ад купала або яго барабана). Часам Т. з'яўляецца апорнай канструкцыяй для вуглавых купалаў, эркераў. Т. былі пашыраны ў сярэдневяковай архітэктуры Пярэдняй і Сярэдняй Азіі, Закаўказзя і Еўропы; у рус. і бел. дойлідстве — пераважна ў 17 ст. Гл. таксама *Ветразі*.



Тромпы.

ТРОН (ад грэч. thronos), 1) багата ўпрыгожанае крэсла на спец. узвышэнні — месца манарха ў час афіц. прыёмаў, урачыстых цырымоній. 2) Сімвал манархічнай улады (быць на Т. — княжыць, каралеваць, царстваваць).

ТРО́НХЕЙМ (Trondheim), горад на ПнЗ Нарвегіі. Адм. ц. фюльке Сёр-Трэндэлаг. Засн. ў 997. Стараж. сталіца Нарвегіі (пад назвай Нідарас). Да 1380 і з 1814 месца каранавання нарвежскіх каралёў. Каля 150 тыс. ж. (2001). Порт у Тронхеймс-фіёрдзе, у вусці р. Нідэльв. Вузел чыгунак і аўтадарог. Аэрапорт. Прам-сць: маш.-буд., лесаперапр., рыбаперапр., харчовая. Ун-т. Музеі: маст. прам-сці Паўн. Нарвегіі, Народны на адкрытым паветры, Маст. галерэя. Рамана-гатычны сабор (12—14 ст.).

ТРОП (ад грэч. tropos паварот, моўны зварот, вобраз), слова ці моўны выраз, ужытыя ў пераносным значэнні; адзін з прыёмаў стварэння *мастацкага вобраза*. У аснове Т. — суадносіны на аснове агульных рыс дзвюх з'яў, адна з якіх характарызуецца праз прыкметы другой. Т. падзяляюцца на простыя (*параўнанне, эпітэт*) і складаныя (*метафара, метанімія, сінекдаха, сімвал, алегорыя, гіпербала, літота, іронія, гратэск, перыфраза, этымалагізм*). Найчасцей выкарыстоўваецца ў маст. л-ры. *В.П.Рагойша.*

ТРО́ПІКІ [ад грэч. tropikos (kyklos) круг павароту], геаграфічныя паралелі, адлеглыя на 23°27′ на Пн і на П ад экватара. Называюцца адпаведна Паўночны, або Т. Рака, і Паўднёвы, або Т. Казярога. У дзень летняга сонцастаяння (21—22 чэрв.) Сонца знаходзіцца ў поўдзень у зеніце для месц, якія ляжаць на Паўн. Т., у дзень зімовага сонцастаяння (21—22 снежня) — для месц, якія ляжаць на Паўд. Т. Часам Т. наз. усю шыротную зону, якая заключана паміж Паўн. і Паўд. Т. — экватарыяльны пояс і 2 трапічныя паясы Зямлі.

ТРО́СНА, возера ў Полацкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Палата, за 33 км на ПнУ ад г. Полацк. Пл. 0,45 км^2, даўж. 1 км, найб. шыр. 600 м, даўж. берагавой лініі 2,77 км, пл. вадазбору 3,5 км^2. Схілы катлавіны выш. 5—10 м. Берагі нізкія, на З забалочаныя. Востраў пл. каля 1 га. Выцякае ручай у р. Палата.

ТРО́СНА, возера ў Полацкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Тросніца (выцякае з возера), за 20 км на ПнУ ад г. Полацк. Пл. 0,28 км^2, даўж. 1,4 км, найб. шыр. 350 м, даўж. берагавой лініі 3,1 км, пл. вадазбору 13 км^2. Схілы катлавіны пераважна не выражаны, месцамі выш. да 2 м, пад лесам, на У разараныя. Берагі забалочаныя, сплавінныя. Пойма шыр. 25—50 м, забалочаная. Выцякае ручай у возера без назвы.

ТРО́СНА, возера ў Полацкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Бельчыца, за 5 км на Пд ад г. Полацк. Пл. 0,25 км^2, даўж. 550 м, найб. шыр. 480 м, даўж. берагавой лініі 1,55 км, пл. вадазбору 2,62 км^2. Схілы катлавіны выш. да 5 м, на З і Пн не выражаны. Выцякае ручай у р. Бельчыца.

ТРОФ..., ...ТРОФ (ад грэч. trophē ежа, жыўленне), частка складаных слоў, якая паказвае на сувязь з паняццямі «ежа», «жыўленне» (напр., *трофаэкалогія, аўтатрофы, гетэратрофы*).

ТРОФАБІЁЗ (ад *троф...* + *...біёз*), узаемавыгаднае сумеснае жыццё 2 відаў, якія выкарыстоўваюць у якасці корму прадукты метабалізму адзін аднаго. Напр., мурашы родаў мірміка, тапінома, лусіус, крэматагастэр ахоўваюць і гадуюць у сваіх гнёздах розных насякомых (цыкад, афід, какцыд, вусеняў матылёў) і жывяцца іх выдзяленнямі.

ТРОФАЦЭНО́З (ад *троф...* + *цэноз*), згуртаванне арганізмаў, звязаных паміж сабой выкарыстаннем частак адной здабычы. Напр., здабычай ільвіц карыстаюцца акрамя членаў прайда гіены, шакалы, птушкі. У Т. уключаюцца шматлікія віды насякомых і мікрааргінізмаў. Найб. характэрны для саваннаў. У таежных лясах за кошт здабычы ваўкоў існуюць расамахі, часткова лісы, куніцавыя, вароны, сарокі і інш.

ТРОФАЭКАЛО́ГІЯ (ад *троф...* + *экалогія*), экалогія харчавання, раздзел экалогіі, які вывучае сукупнасці *трафічных ланцугоў* у біягеацэнозах. Асн. праблемы Т.: суадносіны розных *трафічных узроўняў* папуляцый (трафічная структура), харч. спектры і аб'ём корму розных відаў, метады вызначэння тыпаў жыўлення, залежнасць інтэнсіўнасці і спектраў жыўлення ад абіятычных і біятычных фактараў асяроддзя і інш. Фундаментальныя канцэпцыі Т. распрацаваў англ. эколаг Ч.Элтан (1927).

ТРО́ФІКА НЕРВО́ВАЯ, уплыў *нервовай сістэмы* на структурна-хім. арганізацыю органаў і тканак, іх рост і развіццё праз уздзеянне на абмен рэчываў. Выпадзенне трафічнага рэгулявання суправаджаецца паталаг. зменамі ў тканках (атрафіі, змярцвенні, язвы), т.зв. нейрагенныя дыстрафіі. Трафічная функцыя ўласціва амаль усім нервам, таму спец. трафічных нерваў мала. Да іх адносяць сімпатычныя нервы, што стымулююць абмен рэчываў у міякардзе, нервы, якія мабілізуюць тлушчавыя запасы, і інш. У працэсе Т.н. удзельнічаюць медыятары (катэхаламіны, сератанін, гістамін і інш.) і некат. неідэнтыфікаваныя хім. злучэнні, што ўтвараюцца ў нерв. стволах.

А.С.Леанцюк.

ТРОХ ЦЕЛ ЗАДА́ЧА ў нябеснай механіцы, задача пра вызначэнне руху 3 цел, якія ўзаемна прыцягваюцца паводле *сусветнага прыцягнення закону*.

Сфармулявана І.*Ньютанам*. Л.*Эйлер* (1767) і Ж.Л.*Лагранж* (1772) знайшлі класы частковых рашэнняў агульнай (неабмежаванай) Т.ц.з., пры якіх целы адвольных мас рухаюцца па *канічных сячэннях* аднолькавага выгляду, а ўтвораная імі канфігурацыя ўвесь час падобная да самой сябе — целы застаюцца на адной прамой (калінеарныя эйлеравы рашэнні) ці ўтвараюць роўнастаронні трохвугольнік (трохвугольныя лагранжавы рашэнні). Астр. назіранні пацвердзілі, што гэтыя рашэнні рэалізуюцца ў прыродзе (гл. *Траянцы*). Агульнае рашэнне неабмежаванай Т.ц.з. знойдзена ў выглядзе бесканечных шэрагаў. З-за іх надзвычай павольнай збежнасці часцей выкарыстоўваюць якасныя ці прыблізныя лікавыя метады рашэння або разглядаюць спрошчаную (абмежаваную) Т.ц.з. Рашэнні розных тыпаў абмежаванай Т.ц.з. знайшлі шматлікія дастасаванні ў тэорыі руху Месяца і планет, дынаміцы касм. палёту.

Літ.: Рябушко А.П. Движение тел в общей теории относительности. Мн., 1979; Рой А.Э. Движение по орбитам: Пер. с англ. М., 1981; Себехей В. Теория орбит: Ограниченная задача трех тел: Пер. с англ. М., 1982.

М.М.Касцюковіч.

ТРОХАДЗІ́НАЕ КАРАЛЁЎСТВА, афіцыйная назва ў 2-й пал. 16 ст. — 1918 комплексу з 3 асн. харвацкіх зямель — уласна Харваты, Далмацыі і Славоніі ў складзе імперыі аўстр. *Габсбургаў* (з 1867 *Аўстра-Венгрыі*).

ТРОХБО́Р'Е СІЛАВО́Е, від спорту, тое, што *пауэрліфтынг*.

ТРОХВУГО́ЛЬНІК, частка плоскасці, абмежаваная 3 адрэзкамі прамых (старанамі), якія маюць папарна адзін агульны канец (вяршыню). Адрозніваюць востравугольны, прамавугольны (адзін з вуглоў прамы), тупавугольны (адзін з вуглоў тупы), таксама Т. роўнастаронні (усе стораны роўныя) і раўнабедраны (2 староны роўныя). Сума вуглоў Т. роўная 180°; плошча $S = \frac{1}{2} ah$, дзе a — любая з старон, узятая за яго аснову, h — адпаведная вышыня. Лікавыя суадносіны паміж вугламі і старанамі вывучаюцца трыганаметрыяй. Аб уласцівасцях Т. на сферычнай паверхні гл. ў арт. *Сферычная геаметрыя, Сферычная трыганаметрыя*.



Трохвугольнік: 1 — востравугольны; 2 — прамавугольны; 3 — тупавугольны; 4 — роўнастаронні; 5 — раўнабедраны; h — вышыня; a — аснова.

«ТРОХВУГО́ЛЬНІК» («Dreieck»), кодавая назва карнай аперацыі ням. фашыстаў супраць партызан і насельніцтва на тэр. паміж чыгункамі Брэст—Кобрын і Брэст—Маларыта ў вер.—кастр. 1942 у Вял. Айч. вайну; састаўная частка сумесных планаў паліцыі бяспекі і СД ген. камісарыятаў Валыні, Падоліі, Беларусі і акругі Беласток для «ўціхамірвання» зах. і паўд.-зах. раёнаў Гродзенскай, Баранавіцкай, Брэсцкай і Пінскай абл. Праводзілася сіламі 3-га батальёна 15-га ням. паліцэйскага палка, 3-х узводаў, 2-х паліцэйскіх палкоў, спец. роты «Нюрнберг». Пасля няўдалай карнай аперацыі «Міхель» 30 жн. — 4 вер. ў Косаўскім, Бярозаўскім, Ружанскім і Пружанскім р-нах гітлераўцы распачалі аперацыю «Т.»: рабавалі, расстрэльвалі насельніцтва, палілі хаты, захапілі некалькі тыс. буйной раг. жывёлы, коней, свіней, авечак, шмат с.-г. машын, сотні ц збожжа. У в. Ляплёўка Брэсцкага р-на карнікі расстралялі 54 дзіцяці з выхавацелькай Дамачоўскага дзіцячага дома. Паводле справаздач фаш. улад, з 6 вер. да 24 ліст. ў раёне Брэста, Кобрына, Маларыты і Пінска загублена 44 837 грамадзян.

Літ.: Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941—1945: Энцыкл. Мн., 1990.

ТРОХГРА́ДДЗЕ, гарадская агламерацыя ў Польшчы, на ўзбярэжжы Балтыйскага м.; гл. *Труймяста*.

ТРОХГУ́ЧЧА, 1) сугучча з 3 розных гукаў. 2) *Акорд* з 3 гукаў, якія могуць быць размешчаны па тэрцыях. У залежнасці ад велічыні тэрцый і ад іх узаемнага размяшчэння адрозніваюць Т. мажорнае (вял. тэрцыя + малая тэрцыя), мінорнае (малая тэрцыя + вял. тэрцыя); менш выкарыстоўваюцца паменшанае (малая тэрцыя + малая тэрцыя) і павялічанае (вял. тэрцыя + вял. тэрцыя), якія няўстойлівыя і дысанантныя.

ТРОХПА́ЛЬЦЫ ДЗЯ́ЦЕЛ (Picoides tridactylus), птушка сям. дзятлавых атр. дзятлападобных. Пашыраны ў Еўразіі, Паўн. Амерыцы. На Беларусі трапляецца пераважна ў паўн. ч., занесены ў Чырв. кнігу. Жыве ў хвойных і мяшаных лясах.

Даўж. цела 21—24 см, маса 51—69 г. Спіна белая з шырокімі чорнымі стракацінамі. Цемя ў самцоў залаціста-жоўтае, у самак бурдна-белае. Ад вачэй ідзе вузкая белая паласа, ад дзюбы — чорныя вусы. Шчокі цёмныя. Крылы буравата-чорныя з белымі стракацінамі. Бруха белае, зрэдку з вузкім папярочным малюнкам. На нагах 3 пальцы (адсюль назва). Нясе 3—5 (да 7) яец. Корміцца пераважна насякомымі, што жывуць пад карой дрэў, насеннем, ягадамі.

ТРОХРАДКО́ЎЕ, гл. ў арт. *Тэрцэт*.

ТРОХФА́ЗНЫ ЛАНЦУ́Г, сукупнасць 3 аднафазных эл. ланцугоў (фаз) *пераменнага току*, у якіх дзейнічаюць 3 сінусаідальныя напружанні аднолькавай частаты, зрушаныя па фазе (на 120°) адна адносна другой. Найб. пашыраны сіметрычныя Т.л., утвораныя фазнымі абмоткамі трохфазнага *электрычнага генератара*, прыёмнікамі электраэнергіі (фазамі нагрузкі) і злучальнымі (лінейнымі) правадамі.

Калі фазныя абмоткі генератара і фазы нагрузкі злучаны зоркай, то Т.л. акрамя лінейных можа мець нулявы провад. Па ім цячэ рознасны ток асобных фаз, роўны нулю пры аднолькавых нагрузках усіх фаз і адметны ад нуля пры несіметрычнай нагрузцы. Напружанні паміж лінейнымі правадамі і токі ў гэтых правадах наз. лінейнымі ($U_л$, $I_л$); токі ў фазных абмотках генератара і ў фазах нагрузкі, напружанні на іх — фазнымі ($I_ф$, $U_ф$). Пры злучэнні зоркай $U_л = \sqrt{3}\ U_ф$, токі роўныя; трохвугольнікам — $U_л = U_ф$, $I_л = \sqrt{3}\ I_ф$. Магутнасць сістэмы (Р) складаецца з магутнасцей усіх фаз; пры сіметрычнай нагрузцы $P = \sqrt{3}\, U_л I_л \cos\varphi$, дзе φ — вугал зруху паміж фазнымі напружаннем і токам. Т.л. больш эканамічны, чым аднафазны, дазваляе атрымаць вярчальнае магн. поле ў электрарухавіках. Распрацаваны ў 1891 М.В.*Даліва-Добравольскім*.

У.М.Сацута.

ТРОХЦА́РСТВА, гл. ў арт. *Саньго*.



Трохфазны ланцуг: 1 — з абмоткамі генератара і нагрузкай, злучанымі зоркай; 2 — з абмоткамі генератара, злучанымі зоркай, і нагрузкай, злучанай трохвугольнікам; 3 — з абмоткамі генератара і нагрузкай, злучанымі трохвугольнікам; 4 — крывыя эрс; 5 — вектары эрс; *Г* — генератар; *Н* — нагрузка; *А, В, С* — лінейныя правады; *О* — нулявы провад; $U_л$, $U_ф$, $I_л$, $I_ф$ — лінейныя і фазныя напружанні і токі; *Т* — перыяд пераменнага току; $E_а$, $E_в$, $E_с$ — вектары фазных эрс.

ТРО́ЦКАЯ Таісія Паўлаўна (н. 29.11.1949, в. Бобрына Смаргонскага р-на Гродзенскай вобл.), бел. вучоны ў галіне механізацыі с.-г. вытв-сці. Д-р тэхн. н. (1999). Скончыла БСГА (1972). З 1978 у Гродзенскім с.-г. ін-це, з 1991 у БелНДІ механізацыі сельскай гаспадаркі. З 2000 у Бел. агр. тэхн. ун-це (заг. кафедры). Навук. працы па ўдасканаленні тэхнал. працэсаў сушкі і перадпасяўной апрацоўкі зерня і насення ў азона-паветр. сферы.

Тв.: Энергосберегающая технология сушки сельскохозяйственных материалов в озоно-воздушной сфере. Мн., 1997; Энергосберегающая электроозонированная сушка зерна активным вентилированием (разам з С.М.Карташэвічам) // Механизация уборки, послеуборочной обработки и хранения урожая сельскохозяйственных культур: Науч. тр. М., 2000. Т. 132. *Л.В.Бароўка.*

ТРО́ЦКІ Леў Давыдавіч (сапр. Бранштэйн Лейба; 7.11.1879, в. Янаўка Аляксандраўскага р-на Кіраваградскай вобл., Украіна — 20.8.1940), палітычны і дзярж. дзеяч. Скончыў рэальнае вучылішча ў г. Мікалаеў (1897). У 1903—07 меншавік, пазней займаў прамежкавае становішча паміж *бальшавікамі* і *меншавікамі* і выступаў за іх аб'яднанне. У 1905 у асн. распрацаваў тэорыю «перманентнай» (няспыннай) рэвалюцыі; лічыў, што пралетарыят Расіі пасля ажыццяўлення дэмакр. (буржуазнай) рэвалюцыі адразу пачне сацыяліст. рэвалюцыю, якая пераможа толькі пры дапамозе сусв. пралетарыяту. У рэвалюцыю 1905—07 фактычны лідэр Пецярбургскага Савета рабочых дэпутатаў, рэдактар яго газ. «Известия». У 1907—17 у эміграцыі. У 1908—12 быў рэдактарам газ. «Правда». У 1-ю сусв. вайну стаяў на інтэрнацыяналісцкіх пазіцыях. У жн. 1917 на чале створанай ім Міжраённай аб'яднанай арг-цыі сацыял-дэмакратаў-інтэрнацыяналістаў (каля 4 тыс. чал.) уступіў у бальшавіцкую партыю. У кастр.—ліст. 1917 старшыня Петраградскага Савета, фактычны кіраўнік Петраградскага ВРК, адзін з кіраўнікоў *Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917* у Петраградзе. Чл. ЦК бальшавіцкай партыі са жн. 1917 да кастр. 1927, Палітбюро ЦК (кастр. 1917, сак. 1919 — кастр. 1926). У 1917—18 нарком замежных спраў РСФСР, у 1918—25 нарком па ваен. і марскіх справах, старшыня Рэўваенсавета СССР (да 1923 — РСФСР). З 1925 чл. Прэзідыума ВСНГ СССР. У канцы 1917 — пач. 1918 узначальваў сав. дэлегацыю на мірных перагаворах з Германіяй і яе саюзнікамі (гл. *Брэсцкі мір 1918*), ад удзелу ў якіх адхіліў пралстаўнікоў Рады БНР. Спадзеючыся, што з прычыны рэв. ўздыму ў Германіі і Аўстра-Венгрыі іх войскі не здолеюць наступаць, Т. 10.2.1918 адмовіўся падпісаць мірны дагавор на прапанаваных аўстра-герм. блокам цяжкіх для Расіі ўмовах і пакінуў з дэлегацыяй Брэст, хоць ведаў, што гэта аўтаматычна вядзе да спынення перамір'я на фронце. 14.2.1918 пазіцыю Т. падтрымаў ЦВК РСФСР. Насуперак разлікам Т., герм.-аўстр. войскі 18.2.1918 разгарнулі наступленне па ўсім фронце. У выніку былі акупіраваны б.ч. Беларусі (да Дняпра і Зах. Дзвіны) і многія інш. тэрыторыі, а Брэсцкі мір падпісаны 3.3.1918 Р.Я.*Сакольнікавым* на больш цяжкіх умовах. Т. — адзін са стваральнікаў рэгулярнай Чырв. Арміі, асабіста кіраваў яе дзеяннямі на многіх франтах грамадз. вайны, шырока выкарыстоўваў жорсткія захады для падтрымання дысцыпліны і навядзення «рэв. парадку» на фронце і ў тыле. У час наступлення польскіх войск быў на Беларусі (Гомель, Мінск), выдаў шэраг загадаў, у прыватнасці аб узяцці г. Барысаў. Сэнс існавання сав. улады ў Расіі і ў СССР Т. бачыў у «падштурхоўванні», у т.л. ваен. сродкамі, сусв. пралетарскай рэвалюцыі. У 1919 ён прапаноўваў ЦК партыі «перакінуць» рэвалюцыю ў Азію, у 1923 — увесці Чырв. Армію ў Германію. Сац.-эканам. лад Расіі і СССР Т. называў дзярж. капіталізмам, лічыў, што будаўніцтва сацыялізму тут магчыма толькі пры дапамозе вядучых краін Еўропы, дзе спачатку павінны былі перамагчы пралетарскія рэвалюцыі. Т. і яго прыхільнікі («трацкісты») актыўна ўдзельнічалі ва ўнутрыпарт. дыскусіях пач. 1920-х г., у час якіх заклікалі да пашырэння метадаў *«ваеннага камунізму»*, адзяржаўлення і мілітарызацыі прафсаюзаў, патрабавалі пашырэння парт. дэмакратыі і разам з тым больш цэнтралізаванай гасп. палітыкі, абвяшчалі лозунгі «дыктатуры прам-сці», «звышіндустрыялізацыі» краіны за кошт сялянства, якое лічылі рэакц. класам. Барацьба за лідэрства ў партыі і дзяржаве (пасля адыходу ў канцы 1922 ад спраў хворага У.І.*Леніна)* скончылася перамогай прыхільнікаў І.В.*Сталіна*. XIII парт. канферэнцыя (студз. 1924) асудзіла погляды Т. («трацкізм»), XV з'езд ВКП(б) (1927) абвясціў іх несумяшчальнымі з членствам у партыі, выключыў з партыі Т. разам з групай найб. актыўных прыхільнікаў. У 1928 Т. высланы ў Алматы, у 1929 — за мяжу. Жыў у Турцыі, з 1937 — у Мексіцы. Рэзка крытыкаваў палітыку тагачаснага кіраўніцтва СССР. Ініцыятар стварэння *«Інтэрнацыянала 4-га»* (1938). Забіты агентам сав. НКУС іспанцам Р.Меркадэрам. У наш час прыхільнікі ідэй Т. дзейнічаюць у многіх краінах свету.

Тв.: К истории русской революции. М., 1990; Политические силуэты. М., 1990; Сталин. Т. 1—2. М., 1990; Литература и революция. М., 1991; Моя жизнь. М., 1991.

Літ.: Ленін У.І. Пісьмо да з'езду // Тв. Т. 36 (Полн. собр. соч.; Т. 45); Васецкий Н.А. О Троцком и троцкизме. М., 1989; Ягож. Троцкий: опыт политич. биогр. М., 1992; Дойчер И. Троцкий в изгнании: Пер. с англ. М., 1991; Кушинг Гранвилл Дж. Л.Д.Троцкий и Четвертый Интернационал: Пер. с англ. М., 1993; Воейков М.И. Теоретическое наследие Л.Троцкого и современность. М., 1994; Космач Г.А., Космач Е.Н. Трагедия кумиров революции. Мн., 1994; Лев Троцкий. Мн., 1998; Волкогонов Д.А. Троцкий. Кн. 1—2. М., 1999.

У.А.Бажанаў.

ТРО́ШЧА, возера ва Ушацкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Зах. Дзвіна, за 16 км на ПдУ ад г.п. Ушачы. Пл. 0,51 км², даўж. 1,3 км, найб. шыр. 490 м, найб. глыб. 38,2 м, даўж. берагавой лініі 3,24 км, пл. вадазбору 2,4 км². Катлавіна лагуннага тыпу. Схілы выш. 10—14 м (на ПдЗ да 20 м, на Пн і Пд зніжаюцца да 6 м), усх. — разараныя, зах. — пад лесам. Пойма высокая, сухая, шыр. да 5 м, на Пн і Пд забалочаная, шыр. да 40—150 м. Берагі выш. 0,5—1 м, пясчаныя і супясчаныя, пад лесам і хмызняком, на ПдЗ і ПдУ зліваюцца са схіламі, на Пд на невял. участку сплавінныя. Дно да глыб. 2—2,5 м пясчанае, ніжэй ілістае. Шыр. паласы надводнай расліннасці 5—50 м.

ТРО́ШЫН Афанасій Сямёнавіч (23.12.1912, с. Альза Чамзінскага р-на,

Мардовія, Расія — 24.12.1985), расійскі вучоны ў галіне цыталогіі і біяфізікі. Чл.-кар. АН СССР (1960). Скончыў Ленінградскі ун-т (1936). З 1957 у Ін-це цыталогіі АН СССР (з 1958 дырэктар). Навук. працы па праблемах клетачнай пранікальнасці і ролі клетачных мембран. Распрацаваў сарбцыйную тэорыю клетачнай пранікальнасці і размеркавання рэчываў паміж клеткай і асяроддзем.

Тв.: Проблема клеточной проницаемости. М.; Л., 1956; Транспорт сахаров через клеточные мембраны. Л., 1973 (разам з М.М.Нікольскім). *А.С.Леанцюк.*

ТРО́Я (грэч. Troia), Іліён, старажытны горад на ПнЗ М.Азіі, паліт. цэнтр гіст. вобласці Траада ў 3—2-м тыс. да н.э. Рэшткі Т. знойдзены ў 1865 Г.*Шліманам* у выніку раскопак на ўзгорку Гісарлык. Пазней раскопкі Т. вялі археолагі В.Дзёрпфельд (1893—94), К.Блеген (1932—38). Выяўлены рэшткі 9 паселішчаў эпох бронзы і жалеза. У 3000—2500 да н.э. Т. была крэпасцю з мурамі каля 3 м таўшчыні, яе жыхары займаліся земляробствам, жывёлагадоўляй, ганчарствам, ткацтвам, выплаўлялі медзь. Пасля пажараў 2500 і каля 2200 да н.э. горад адбудаваны, муры ўмацаваны вежамі. На акропалі ўзведзены палац цара. Найвыш. росквіт прыпадае на 1800—1300 да н.э., калі ў гаспадарцы пачалі выкарыстоўваць коней, распаўсюдзіліся новыя буд. прыёмы, вытв-сць бронзы і керамікі. Т. мела гандл. сувязі з Грэцыяй, Крытам, Кіпрам, Хецкім царствам. У час *Траянскай вайны* горад разбураны і больш не дасягнуў былой велічы. Зноў зруйнавана каля 1100 да н.э. Каля 700 да н.э. на яе месцы грэкі заснавалі г. Новы Ілію.

Літ.: Гиндин Л.А. Население гомеровской Трои. М., 1993; Ванденберг Ф. Золото Шлимана: Пер. с нем. Смоленск, 1996; Черветти Д. Золото Трои: Легенда и действительность: Пер. с итал. М., 1996; Дарет Фригийский. История о разрушении Трои: Пер. с лат. СПб., 1997. *А.Г.Зельскі.*

«ТРО́Я», «Гісторыя траянскай вайны», «Аповесць пра Трою», помнік бел. літаратуры 15 ст.; гіст. перакладная аповесць пра падзеі легендарнай Траянскай вайны. Асн. змест твора грунтуецца не на «Іліядзе» Гамера, а на больш позняй апрацоўцы нар. паданняў, якая ў ант. эпоху прыпісвалася грэку Дыктысу і траянцу Дарэсу (Дарэту) і выдавалася за ўспаміны сапр. удзельнікаў вайны. Паслужыла крыніцай для шматлікіх літ. апрацовак. У 15 ст. ўсх. славянам праз паўд.-слав. пасрэдніцтва стала вядома т.зв. «Прытча пра каралёў» з візант. хронікі 12 ст. Канстанціна Манасіі, у канцы 15 ст. перакладзеная на бел. мову. У ёй апісваюцца гісторыя заснавання Троі, незвычайнае жыццё траянскага царэвіча Парыса (у бел. тэксце — Фарыжа), сцісла выкладаецца фальклорна-паэтычная версія прычын узнікнення Траянскай вайны. Асн. месца ў «Т.» займае апавяданне пра падзеі апошняга года вайны, якая скончылася смерцю гал. герояў і разбурэннем Троі. Падзеі ў творы асвятляюцца з гуманістычных пазіцый (асуджаецца неапраўданая жорсткасць на вайне, бязлітаснасць да пераможаных), з глыбокім спачуваннем аўтар ставіцца да трагічнага лёсу траянцаў і іх роднага горада. «Т.» карысталася значнай папулярнасцю сярод бел. чытачоў, яе і *«Александрыю»* згадвае Ф.Скарына.

На Беларусі быў вядомы яшчэ адзін твор пра Траянскую вайну — рыцарскі раман італьянца Гвіда дэ Калумны «Гісторыя разбурэння Троі» (13 ст.), перакладзены на старабел. мову ў канцы 16—17 ст.

Публ.: Хрэстаматыя па старажытнай беларускай літаратуры. Мн., 1959. *В.А.Чамярыцкі.*

ТРУ́А-РЫЎЁР, Трыс-Рыверс (франц. Trois-Rivières, англ. Three Rivers), горад на ПдУ Канады, прав. Квебек. Каля 120 тыс. ж. з прыгарадамі (2001). Порт на р. Св. Лаўрэнція. Вузел чыгунак і аўтадарог. Буйны цэнтр цэлюлозна-папяровай прам-сці; тэкст. і гарбарна-абутковыя прадпрыемствы.

ТРУБА́ (ад стараж. верхненям. trumba, італьян. tromba), духавы амбашурны муз. інструмент. Вядомы са старажытнасці, з 17 ст. выкарыстоўваўся як арк. муз. інструмент. Сучасны тып. Т. з вентыльным механізмам склаўся да сярэдзіны 19 ст. У прафес. муз. практыцы — арк. і сольны муз. інструмент. Разнавіднасці Т.: пікала, малая, альтовая, басовая.

Звесткі пра Т. на тэр. Беларусі адносяцца да 12 ст. («Слова аб паходзе Ігаравым»). У нар. побыце беларусаў пашыраны Т. рознай формы з хвоі (абкручаныя бяростай) і бляхі. На Т. здабываюць гукі натуральнага гукарада. Даўжыня Т. вар'іруецца ад 1,3 да 2,5—3 м. Могуць мець спец. прыстасаванне для губ — муштук. Здаўна Т. выкарыстоўвалі як сігнальны інструмент у пастухоўскім, паляўнічым і ваен. побыце, у час каляндарных абрадаў, часам для забавы. Спрактыкаваныя музыкі выконвалі на Т. польк, вальсы, асобныя ч. кадрылі.



Пастухоўскія **трубы**.

Т. наз. таксама язычковы муз. інструмент конусападобнай формы, зроблены з кары асіны, вольхі, ліпы. Найгрышы на такой Т. — рытмізаванае паўтарэнне аднаго гуку ці вар'іраванне папеўкі на 2—3 гуках натуральнага гукарада. Была пашырана на Беларусі да 1920—30-х г.

Бел. кампазітарамі напісаны для Т. і фп. разнастайныя па змесце і кампазіцыі творы: п'есы (А.Багатыроў, Г.Вагнер, А.Гураў, У.Дамарацкі, У.Кандрусевіч, С.Картэс, Я.Цікоцкі), санаты (П.Падкавыраў, К.Цесакоў), канцэрты для Т. з арк. (Дамарацкі, Г.Гарэлава) і інш.

Літ.: Назина И.Д. Белорусские народные музыкальные инструменты: Самозвучащие, ударные, духовые. Мн., 1979; Усов Ю.А. Труба. 2 изд. М., 1989. *І.Дз.Назіна.*

ТРУБААПРАЦО́ЎЧЫ СТАНО́К, спецыяльны *металарэзны станок* такарнай групы для апрацоўкі *труб*. Па тэхнал. прызначэнні адрозніваюць Т.с.: трубаадразны — для адразання труб і зняцця вонкавых і ўнутр. фасак; трубанаразны — для нарэзвання разьбы; трубапратачны — для апрацоўкі ўнутр. паверхняў і інш.

ТРУБАДУ́РЫ (франц. troubadour ад правanс. trobar складаць вершы), сярэдневяковыя правансальскія вандроўныя паэты-спевакі, звычайна знатнага паходжання. Першыя прадстаўнікі мастацтва, якія валодалі муз. граматай і не былі звязаны з царк. муз. культурай. Звычайна былі адначасова аўтарамі музыкі, тэксту і выканаўцамі сваіх твораў. Усхвалялі рыцарскае куртуазнае каханне, зямныя радасці, героіку крыжовых паходаў і інш. Мелодыі іх песень блізкія да народных. Цікавасць да лірыкі Т. адрадзілася ў пач. 19 ст. *Л.А.Шымановіч.*

ТРУБАЗВА́РАЧНАЯ ВЫТВО́РЧАСЦЬ, выраб метал., пераважна стальных, труб метадам *зваркі* ліста або паласы. Вырабляюць трубы дыяметрам ад 6 мм да 2 м *фармоўкай* (згінаннем ліста ці паласы ў трубу) і наступнай зваркай шва. Паводле размяшчэння зварнога шва адрозніваюць зварку падоўжную і спіральную. Зварныя трубы ў параўнанні з бясшво-



Труба.

вымі маюць меншую таўшчыню сценкі, а трываласць шва не меншую, чым самога металу. Усе тэхнал. аперацыі робяцца на спец. агрэгатах — трубазварачных станах. Паводле спосабу фармоўкі яны бываюць бесперапынныя (фармоўка адбываецца паступова, па меры падоўжнага руху паласы) і перыядычныя (ліст згінаецца ў трубу на ўсю даўжыню адразу). Для зваркі існуюць станы пячной зваркі, зваркі токамі высокай частаты, кантактнай зваркі супраціўленнем, дугавой зваркі пад слоем флюсу ці ў асяроддзі ахоўных газаў. Пры пячной зварцы нагрэтую ў печы да 1300—1330 °С паласу згінаюць у ролі-

каx прафілёвачнага стана ў трубу ці працягваюць праз спец. прыстасаванне (лейку) і адначасова зварваюць краі ўпрытык ці (радзей) у нахлёст. Выкарыстоўваецца для вытв-сці вода- і газаправодных труб дыяметрам 10—114 мм з падоўжным швом. Пры вырабе труб дыяметрам менш за 100 мм да трубазварачнага стану далучаецца рэдукцыйны стан, які павялічвае хуткасць выхаду трубы за кошт памяншэння яе дыяметра і таўшчыні сценак. На сучасных станах хуткасць выхаду пры дыяметры 10 мм складае 24 м/мін. Пры вырабе труб дыяметрам да 500 мм з падоўжным ці спіральным швом пашыраны станы, дзе зварка ажыццяўляецца ціскам з нагрэвам краёў, якія зварваюцца токамі павышанай і высокай частаты. На трубазварачным стане з дугавой зваркай вырабляюць трубы ад 500 да 1600 мм і больш.

На Беларусі наладжана вытв-сць стальных электразварных труб квадратнага, прамавугольнага і круглага сячэння. У 2001 *Магілёўскі металургічны завод* вырабляў стальныя профільныя трубы 22 мадыфікацый (ад 20 × 20 мм да 80 × 60 мм з таўшчынёй сценак 1,2—4 мм), прамашвовыя круглага сячэння — 18 мадыфікацый (дыяметр ад 16 да 89 мм), стальныя вода- і газаправодныя — 8 мадыфікацый (дыяметр ад 15 да 80 мм); Маладзечанскі завод металаканструкцый — профільныя 18 мадыфікацый (ад 50 × 50 мм да 220 × 120 мм з таўшчынёй сценак ад 2 да 8 мм) і круглага сячэння 8 мадыфікацый (дыяметр ад 76 мм да 219 мм); Баранавіцкае прадпрыемства «Аграбудмаш» — стальныя прамашвовыя круглага сячэння 3 мадыфікацый (дыяметр 26, 34 і 42 мм з таўшчынёй сценак да 2,5 мм) і прамавугольныя (30 × 20 мм).

А.А.Кацюшкін, Д.С.Рагуновіч.

ТРУБАЛІЦЭ́ЙНАЯ ВЫТВО́РЧАСЦЬ, выраб труб і трубных загатовак метадам *ліцця*.

Т.в. ажыццяўляецца пераважна цэнтрабежным і паўбесперапынным ліццём, трубных загатовак — ліццём у разавых формах, цэнтрабежным, бесперапынным у гарыз. і верт. крышталізатарах, намарожваннем і інш. Пры цэнтрабежным ліцці труб вадкі метал крышталізуецца ў вярчальнай вакол гарыз. восі метал. форме. Ад дзеяння цэнтрабежных сіл утвараецца шчыльная дробназярністая структура металу і трубы маюць павышаныя мех. якасці. Для паўбесперапыннага ліцця чыгунных напорных труб ужываюцца спец. ўстаноўкі, асн. вузлы якіх — літніковая сістэма, крышталізатар, рухомы стол. Вадкі метал з літніковай сістэмы паступае ў кальцавую прастору паміж вонкавым і ўнутр. крышталізатарам. Пасля запаўнення раструбнай часткі, калі меніск дасягае пэўнага стану, зацвярдзелую трубу разам з рухомым сталом перамяшчаюць уніз; пры дасягненні зададзенай даўжыні яе вымаюць з крышталізатара. Такі спосаб эканамічны, не патрабуе складанага абсталявання, мае высокую прадукцыйнасць, дазваляе вырабляць трубы практычна ўсякай даўжыні і дыяметра з нязначнымі адхіленнямі таўшчыні сценак і ўнутр. дыяметра, лепшай гідрашчыльнасці і інш. Устаноўка простая па канструкцыі і ў абслугоўванні, патрабуе нязначных капіталаўкладанняў, на адной машыне можна вырабляць 5—6 труб розных дыяметраў. Яе недахопам з'яўляецца абмежаваная (7—30 мм) таўшчыня сценак труб.

Першыя чыгунныя трубы на Беларусі адліты ў 1932 на *Магілёўскім металургічным заводзе*. У 1952 упершыню ў СССР тут асвоена прамысл. ўстаноўка па вырабе чыгунных напорных труб паўбесперапынным спосабам. На 2002 на з-дзе працуе 8 машын паўбесперапыннага ліцця, якія адліваюць чыгунныя трубы даўж. 5,5 м і дыяметрам 100, 150, 200, 250, 300, 400 мм. Разнавіднасць Т.в. — адліўка злучальных частак трубаправодаў (муфты, трайнікі, вугольнікі і інш.) робіцца на *Мінскім заводзе ацяпляльнага абсталявання*. Гл. таксама *Ліцейная вытворчасць*.

Я.І.Маруковіч.

ТРУБАПРАВО́Д, сістэма з металічных (часам поліэтыленавых, жалезабетонных і інш.) *труб*, злучаных паміж сабой з дапамогай зваркі, муфтаў, фланцаў; аснова *трубаправоднага транспарту*. Прызначаны для транспартавання вадкіх, газападобных і цвёрдых рэчываў, а таксама кантэйнераў, гатовых вырабаў, пошты, дакументацыі і інш. (гл. *Водаправодная сетка, Газаправод, Гідраўлічны транспарт, Каналізацыйная сетка, Нафтаправод, Пнеўматычны транспарт*). Аснашчаны спец. арматурай (краны, засаўкі і інш.), рэгулюючымі і запорнымі прыстасаваннямі, кантрольна-вымяральнымі прыладамі. Для пракладкі Т. выкарыстоўваюць *трубаўкладчыкі*.

ТРУБАПРАВО́ДНЫ ТРА́НСПАРТ, від *транспарту*, які ажыццяўляе перадачу на адлегласць вадкіх, газападобных ці цвёрдых прадуктаў па *трубаправодах*. Прызначаны для транспарціроўкі газу (*газаправод*), нафты і нафтапрадуктаў (*нафтаправод*), цвёрдых матэрыялаў (*гідраўлічны транспарт, пнеўматычны транспарт*). У залежнасці ад прызначэння і тэр. размяшчэння адрозніваюць Т.т. магістральны і прамысловы (найб. пашыраны). Прамысловы выкарыстоўваецца для транспарціроўкі грузаў, якія перадаюцца па трубах у межах прадпрыемства для працягу тэхнал. працэсу. Да магістральнага Т.т. належаць газа- і нафтаправоды, па якіх транспарціруюцца прадукты ад месца здабычы да месца перапрацоўкі і спажывання (заводы, марскія парты). Па магістральных прадуктаправодах транспарціруюцца гатовыя нафтапрадукты (бензін, дызельнае паліва і інш.) з заводаў у раёны спажывання. Да Т.т. адносяцца таксама нафтабазавыя, унутрыпрамысловыя нафта-, газа-, прадуктаправоды, гарадскія газаразмеркавальныя, водаправодныя і каналізацыйныя сеткі і г.д. Вядучая краіна ў галіне Т.т. Японія. На Беларусі агульная працягласць магістральных нафтаправодаў рознага дыяметра (630, 720, 820, 1020 мм) у аднаніткавым вылічэнні 3 тыс. км, прадуктаправодаў 1,4 тыс. км, газаправодаў 6,7 тыс. км, размеркавальных газаправодаў 22 тыс. км (2002). Будуецца газаправод Ямал—Еўропа, першы ўчастак (209 км) здадзены ў эксплуатацыю (1999). Удзельная вага Т.т. ў агульным грузаабароце краіны 58% (2001). Схему магістральных нафтаправодаў гл. ў арт. *Нафтаправод*.

М.М.Кунцэвіч, Л.В.Несцераў.

ТРУБАПРАКА́ТНАЯ ВЫТВО́РЧАСЦЬ, выраб бясшвовых (без зварнога падоўжнага ці спіральнага шва) метал. *труб* спосабам *пракаткі*. Уключае транспартаванне загатовак (здзіткаў) да награвальных печаў, награванне загатовак, пракатку труб, іх каліброўку, ахаладжэнне, праўку, абрэзку і інш. Асн. тэхнал. абсталяванне Т.в. — *трубапракатныя агрэгаты*, якія адрозніваюцца тыпаразмерам вырабляемых труб і спосабам іх пракаткі. Працэс гарачай пра-

каткі ўключае: *прашыўку* нагрэтай загатоўкі (злітка) і атрыманне таўстасценнай гільзы на прашыўных станах; раскатку гільзы да пэўнай таўшчыні сценак, дыяметра і даўжыні трубы на бесперапынным, кароткаапраўным, пілігрымавым, трохвалковым пракатных станах. Бесперапынны стан (найб. прадукцыйны) ужываецца пры пракатцы труб дыяметрам 110 мм; кароткаапраўны (аўтаматычны) — для вырабу труб дыяметрам ад 60 да 450 мм і больш; пілігрымавы — дыяметрам 400—700 мм, трохвалковы стан — таўстасценных труб дыяметрам 35—200 мм (для кольцаў падшыпнікаў качэння). Пасля раскаткі трубы каліброўюцца на калібровачных станах (гл. *Калібр*), ахалоджваюцца і правяцца. Трубы дыяметрам да 70 мм атрымліваюць абцісканнем гарачых трубных загатовак на рэдукцыйных станах. Для змяншэння таўшчыні сценкі і дыяметра, надання трубе больш высокіх мех. уласцівасцей, гладкай паверхні і дакладных памераў пасля гарачай пракаткі яе ставяць на станах перыяд. дзеяння, на халодную пракатку, а таксама працягваюць праз валокі *валачыльнага стану*. Бясшвовыя трубы ўжываюцца ў машынабудаванні, нафтаздабыўной, хім. прам-сці, у камунальнай гаспадарцы і інш. Асн. прадпрыемствамі па іх вырабе ў СНГ з'яўляюцца Перваўральскі навatрубны і Нікапальскі паўднёватрубны з-ды.

Я.Б.Лажэчнікаў.

ТРУБАПРАКА́ТНЫ АГРЭ́ГАТ, сістэма канструктыўна аб'яднаных *пракатных станаў* і дапаможных машын для выра-

бу метал. бясшвовых труб са зліткаў, кованых або качаных загатовак; асн. від абсталявання *трубапракатнай вытворчасці*. Уключае станы прашыўны (для атрымання таўстасценнай трубы, т.зв. гільзы), падаўжальны (для раскаткі гільзы), абкатны і калібровачны (у некаторых Т.а. і рэдукцыйны). Паводле тыпу стана-падаўжальніка (аўтам., піліграмавы, трохвалковы, бесперапынны, рэйкавы) наз. і Т.а. Найб. пашыраны Т.а. з бесперапынным падаўжальным станам, на якіх робяць трубы дыям. да 102 мм.

ТРУБАРЭ́З, прыстасаванне для рэзкі труб. Адрозніваюць Т. ручны (рэзка робіцца пры дапамозе ролікаў; трубу замацоўваюць у цісках, а Т. круцяць вакол яе) і кумулятыўны (рэзка ўзрывам). Складаецца з 2 трубчастых паўкольцаў, якія запаўняюцца *гексагенам*. Падрыў зарада выконваюць дыстанцыйна праз электрадэтанатар.



Трубарэз: 1 — рэгулявальная шруба; 2 — корпус; 3 — рэзальныя ролікі.

ТРУБАЎКЛА́ДЧЫК, самаходная (часам прычапная) грузападымальная машына з навясным абсталяваннем, прызначаная для пракладкі *трубаправодаў*. Робіцца на базе гусенічнага трактара, выкарыстоўваецца сумесна з інш. спец. машынамі.

Т. падтрымліваюць трубы і плеці з іх пры зварцы, укладваюць трубы ў траншэі, цыліндры і гарлавіны ў калодзежы і камеры, выконваюць інш. пагрузачна-разгрузачныя работы, у т.л. ў меліярац. буд-ве. Прычапныя Т. манціруюць на 2-восевым прычэпе, на якім устанаўліваюць паваротную калонку з пад'ёмнай стралой і трубазахопным прыстасаваннем; агрэгатуюцца з трактарамі МТЗ і інш. Грузападымальнасць Т. да 50 т і больш.

В.М.Кандрацьеў.

ТРУБАЧО́Ў Алег Мікалаевіч (23.10.1930, г. Валгаград, Расія —9.3.2002), рускі мовазнавец. Чл.-кар. АН СССР (1972). Акад. Рас. АН (1992). Скончыў Днепрапятроўскі ун-т (1952). З 1953 у Ін-це славяназнаўства і балканістыкі АН СССР, у 1961—2001 у Ін-це рус. мовы імя Вінаградава Рас. АН (стварыў і ўзначальвае сектар, потым аддзел этымалогіі і анамастыкі, у 1966—82 адначасова нам. дырэктара), з 1999 адначасова гал. рэ-



дактар час. «Вопросы языкознания». Асн. працы па слав. і індаеўрап. этымалогіі, усх.-слав. анамастыцы, этнагенезе і культуры стараж. славян, літуаністыцы. Гал. рэдактар і адзін з аўтараў «Этымалагічнага слоўніка славянскіх моў» (вып. 1—28, 1974—2001). Пераклаў з ням. мовы і дапоўніў «Этымалагічны слоўнік рускай мовы» М.Фасмера (т. 1—4, 1964—73; 3-е выд., 1996).

Тв.: История славянских терминов родства и некоторых древнейших терминов общественного строя. М., 1959; Происхождение названий домашних животных в славянских языках. М., 1960; Ремесленная терминология в славянских языках. М., 1966; Этногенез и культура древнейших славян. 2 изд. М., 2002.

ТРУБА́ЧЫ, стэнтары (Stentor), род прасцейшых кл. раснічных інфузорый. Каля 20 відаў. Пашыраны ў морах і прэсных водах. На Беларусі найб. трапляюцца Т.: звычайны (S.polymorphus) і блакітны (S.coerulus). Свабодна плаваюць, могуць прымацоўвацца да субстрату.

Даўж. да 1 мм. Цела лейкападобнае, расшыранае на пярэднім канцы, укрытае шчыльнай пелікулай з густымі раснічкамі. Здольныя рэзка скарачацца. Размнажаюцца бясполым шляхам (дзяленне папалам) і палавым (*кан'югацыя*). Кормяцца дробнымі арган. рэшткамі, бактэрыямі, водарасцямі, прасцейшымі. Могуць рэгенерыраваць: з кожнай ч. цела, у якой ёсць макрануклеус, аднаўляецца ўвесь арганізм. Біял. меліяратары.

ТРУ́БКА ВЫ́БУХУ, дыятрэма, трубкападобны канал, утвораны пры прарыве газаў праз пласты зямной кары і запоўнены брэкчыяпадобнымі пародамі. Звязаны з глыбіннымі разломамі. У папярочніку да 1 км. На глыбіні злучаюцца *дайкамі*. На стараж. платформах (Паўд.-Афрыканская, Індыйская, Аўстралійская, Сібірская, Усх.-Еўрапейская) бываюць запоўнены брэкчыяпадобнымі ультраасн. магматычнымі пародамі (*кімберлітамі*, лампраітамі); з іх 8—10% — алмазаносныя. Найб. алмазаносных Т.в. ў Паўднёва-Афрыканскай Рэспубліцы, Расіі (Рэспубліка Саха). На Беларусі Т.в. выяўлены на Жлобінскай седлавіне. *У.І.Шкуратаў.*

ТРУБКАЗУ́БЫЯ (Tubulidentata), атрад плацэнтарных млекакормячых. Вядомы з пліяцэну Еўразіі і міяцэну Афрыкі (каля 20—5 млн. г. назад). Адзіны сучасны від — трубказуб афрыканскі (Orycteropus afer). Пашыраны ў Афрыцы на Пд ад Сахары. Жыве ў разнастайных ландшафтах.

Даўж. цела да 158 см, хваста да 61 см, маса да 82 кг. Скура тоўстая, ружавата-шэрая, з рэдкім валасяным покрывам. Вушы доўгія (да 21 см), трубкаватыя. Канец морды выцягнуты ў трубку. Зубы складаюцца са зрослых дэнтынавых трубачак (адсюль назва), растуць усё жыццё. Пярэднія канечнасці 4-, задніе 5-пальцыя, з моцнымі капытападобнымі кіпцюрамі, з дапамогай якіх Т. разбураюць тэрмітнікі, рыюць грунт. Кормяцца тэрмітамі, мурашкамі, інш. насякомымі. Нараджаюць 1, зрэдку 2 дзіцяняці ў год. Аб'ект палявання.

Э.Р.Самусенка.



Да арт. **Трубказубыя**. Трубказуб афрыканскі.

ТРУБКАКРУ́ТЫ, трубакруты (Attelabidae), сямейства жукоў падатр. разнаедных. Каля 1,3 тыс. відаў. Пашыраны пераважна ў трапічных лясах. Жывуць на лясных і пладовых дрэвах, кустах. На Беларусі каля 20 відаў. Найб. трапляюцца Т.: арэшнікавы (Apoderus coryli), дубовы (Attelabus curculionides), тапалевы (Byctiscus populi); шкоднікі садоў *букаркі, слонікі* вішнёвы (Rhynchites auratus), слівавы (R.cupreus).

Вонкава падобны да слонікаў. Даўж. да 15 мм. Цела яркае — зялёнае, сіняе, чорнае, чырв., нярэдка з метал. бляскам. Галава выцягнута ў галаватрубку. Хабаток тоўсты, сагнуты. Вусікі булавападобныя, 11- і 12-членікавыя. Брушка кароткае, шырокае. Надкрылы амаль чатырохвугольныя, не прыкрываюць канец брушка. Расліннаедныя. Большасць відаў адкладвае яйцы ў тканкі ліста і скручвае яго ў трубку (адсюль назва). Лічынкі белыя, бязногія, С-падобна выгнутыя. Акукліваюцца ў глебе.

С.Л.Максімава.



Трубкакруты: 1 — казарка пладовая; 2 — арэхавы; 3 — таполевы; 4 — букарка пладовая.

ТРУБКАНО́СЫЯ, атрад птушак, гл. *Буравеснікападобныя.*

ТРУБЧА́СТАЯ ПЕЧ, 1) тое, што *вярчальная печ*. 2) Апарат для высокатэмпературнага нагрэву нафты і нафтапрадуктаў пры іх перапрацоўцы. Складаецца са змеевіка і экранаў, размешчаных у топачнай камеры.

ТРУ́БЫ, пустацелыя цыліндрычныя або профільныя вырабы значнай даўжыні ў параўнанні з папярочным сячэннем. Адрозніваюць Т. метал. і неметалічныя. Злучаюцца з дапамогай зваркі, таксама раструбаў, муфтаў, фланцаў. Як асобныя элементы ці злучаныя ў трубаправоды выкарыстоўваюцца для перамяшчэння цел у газападобным (газаправоды), вадкім (вода-, нафтаправоды) або цвёрдым стане (гл. *Пнеўматычны транспарт*). Паводле ліквавага значэння ціску вадкасці, што працякае па трубаправодзе, адрозніваюць Т. безнапорныя, маланапорныя і напорныя.

Металічныя Т. паводле спосабу вытв-сці падзяляюцца на стальныя (6 класаў) і чыгунныя; бясшвовыя, зварныя, літыя (гл. *Трубазварачная вытворчасць, Трубаліцейная вытворчасць, Трубапракатная вытворчасць*). Стальныя Т. выкарыстоўваюцца ў магістральных трубаправодах высокага і нізкага ціску для падачы вады, газу, нафты, таксама ў машынабудаванні, буд., хім., харч. прам-сці, ядз. тэхніцы, як стальныя канструкцыі маставых кранаў, буравых вышак і інш.; чыгунныя Т. — у асн. для водаправодных і каналізацыйных сетак, газа- і нафтаправодаў (безнапорных) і інш. Неметалічныя Т. вырабляюцца з розных тыпаў бетону (у т.л. з жалезабетону), цэменту (у т.л. з азбацэменту), палімерных матэрыялаў, цэглы, шкла, керамічных матэрыялаў і інш. Жалезабетонныя, азбацэментныя Т. выкарыстоўваюцца ў кана-



Трубаўкладчык: а — агульная будова (1 — гідрацыліндр, 2 — процівага, 3 — страла, 4 — грузавы паліспаст, 5 — захопнае прыстасаванне), б — Д 355 С-з «Комацу» (Японія).

лізацыйных, арашальных і асушальных сістэмах; жалезабетонныя і бетонныя, мураваныя Т. — таксама пад насыпнымі збудаваннямі для пастаянных вадацёкаў, пропуску ліўневых і расталых вод і інш.; Т. з палімерных матэрыялаў, шклапластыкаў, пластмас — у сістэмах водазабеспячэння, каналізацыі, электраправодкі, таксама ў газа- і нафтаправодах, для перапампоўвання розных хімікатаў; Т. з керамічных матэрыялаў (звычайна з тугаплаўкіх глін) — у каналізацыйных, дрэнажных сістэмах і інш.; шкляныя — для транспарціроўкі агрэсіўных вадкасцей і газаў у хім., нафтаперапрацоўчай, таксама харч. і фармакалагічнай прам-сцях; каменялітыя — для абразіўных матэрыялаў і пульпаў у вугальнай, металургічнай, энергет. прам-сці і інш.

«ТРУ́БЫ», «Тромбы», прыватнаўласніцкі герб, якім карысталіся больш за 100 родаў Беларусі, Украіны, Літвы і Польшчы, у т.л. Войны, Грычыны, Нарбуты, Осцікі, Радзівілы, Развадоўскія, Рудаміны, Хвальчэўскія. Мае ў чырвоным полі 3 чорныя паляўнічыя трубы, злучаныя муштукамі, кожная з 4 залатымі паяскамі і перакручаным шнуром. Клейнод — над прылбіцай з каронай 5 страусавых пёраў. Вядомы з канца 14 ст., у ВКЛ — пасля *Гарадзельскай уніі 1413.*

ТРУБЯЦКА́Я Кацярына Іванаўна (дзявочае Лаваль; 3.12.1800 — 26.10.1854), княгіня, жонка дзекабрыста С.П.*Трубяцкога*. Першая сярод жонак дзекабрыстаў паехала за мужам у Сібір (ліп. 1826). У Іркуцку, затрыманая ўладамі, афіцыйна адмовілася ад грамадз. правоў і дваранскіх прывілей.' М.А.Някрасаў увекавечыў імя Т. у паэме «Рускія жанчыны».

ТРУБЯЦКІ́Я, княжацкі род, прадстаўнікі якога ў 16 — пач. 20 ст. адыгрывалі важную ролю ў жыцці ВКЛ і Расіі. Вядуць радаслоўную ад унука вял. кн. ВКЛ Гедзіміна *Дзмітрыя Альгердавіча*, які валодаў г. Трубчэўск (адсюль прозвішча) на Браншчыне. Яго нашчадкі кн. Трубчэўскія, пазней Т., захоўвалі свой удзел у ВКЛ да 1500, калі кн. Андрэй Іванавіч (?—1546) пасля заняцця маскоўскім войскам г. Трубчэўск перайшоў на службу да маскоўскага вял. кн. *Івана III*. Сярод яго нашчадкаў найб. вядомыя:

Юрый Мікітавіч (? — да 1634), стольнік, ваявода цара *Васіля Іванавіча Шуйскага*. З 1611 у Рэчы Паспалітай, дзе ў 1621 атрымаў г. Трубчэўск з воласцю (з 1618 у складзе ВКЛ). Аляксей Мікітавіч (?—1680), брат Юрыя, баярын, ваявода. У час вайны Расіі з Рэччу Паспалітай (1654—67) штурмам узяў г. Мсціслаў, дзе загінула шмат жыхароў («Трубяцкая разня»). Пётр (каля 1610—44), сын Юрыя Мікітавіча, падкаморый, потым маршалак старадубскі. Юрый (?—1679), сын Пятра. Пасля пераходу ў выніку размежавання 1645 г. Трубчэўск ў склад Расіі выехаў у Маскву, дзе атрымаў чын баярына. Пачынальнік галін роду, што існуюць і ў нашы дні. *М.Э.Красноў.*

ТРУБЯЦКО́Й (Trubetzkoy) Мікалай Сяргеевіч (16.4.1890, Масква — 25.6.1938), расійскі лінгвіст, культуролаг і філосаф; тэарэтык *еўразійства*; прадстаўнік *пражскай школы* ў мовазнаўстве. Сын С.М.*Трубяцкога*. Скончыў Маскоўскі ун-т (1913). У 1919 эмігрыраваў у Сафію. З 1922 у Вене, з 1923 праф. Венскага ун-та. Распрацаваў шэраг новых кірункаў у лінгвістыцы: *фаналогію, марфаналогію*, гісторыю літ. моў, тыпалогію моўных структур, *кантрастыўную лінгвістыку*. Для параўнальнага вывучэння моў абгрунтаваў неабходнасць 3 падыходаў: гіст.-генетычнага, арэальна-гіст. і тыпалагічнага. Выявіў заканамернасці фанетычнага строю малавывучаных моў (фіна-угорскіх, каўказскіх, палеаазіяцкіх). Распрацаваў перыядызацыю стараж. агульнаслав. моўнай гісторыі. Сфармуляваў паняцце «моўнага саюзу» для характарыстыкі моў, пашыраных у адной геагр. зоне і культ.-гіст. вобласці. Распрацаваў дынамічную тыпалогію моў, з дапамогай якой імкнуўся рэканструяваць стараж. этапы моўнай гісторыі і мадэліраваць тэндэнцыі моўнага развіцця ў будучыні. Паводле Т., усе тэарэт. і практычныя даследаванні ў навуцы павінны накіроўвацца на правільнае развіццё асобы. Гарманічнае развіццё чалавека звязваў з яго рэалізацыяй у творчасці. Перадумовай творчай дзейнасці чалавека і яго «самаажыццяўлення» лічыў самапазнанне, якое, на думку Т., знаходзіцца ў пастаянным узаемадзеянні з калектыўна-нац. самапазнаннем («Пра сапраўдны і несапраўдны нацыяналізм», 1921). Абсалютызаваў ролю нац. культур і абвяргаў ідэю стварэння агульначалавечай культуры, якая, на яго думку, можа прывесці да утылітарнага светапогляду і нівеліроўкі духоўных патрэбнасцей чалавецтва. Падзел культур на прымітыўныя і развітыя лічыў памылковым тэзісам еўропацэнтрычнай навукі; сцвярджаў, што вывучэнне культур павінна ажыццяўляцца паводле прынцыпу раўназначнасці і «якаснай непараўнальнасці» культур («Еўропа і чалавецтва», 1920). У «рамана-германскай» еўрапеізацыі бачыў гал. небяспеку для культ.-гіст. развіцця чалавецтва як сукупнасці непаўторных культур розных народаў («шматчалавечых асоб»). Крытыкаваў славянафілаў за імкненне ствараць сваю культуру на ўзор чужой «вялікай» культуры, далучыць да сваёй культуры чужыя «малыя» культуры і пераўтварыць іх на свой лад, за арыентацыю на далёкае мінулае сваёй культуры; рэалізацыя славянафільскіх ідэй, на думку Т., прывяла б да нац. абязлічання, страты чысціні этнасу і нац. ідэі, застою і парушэння сувязі культуры з менталітэтам яе носьбітаў. Лічыў, што рус. культура ўтварае асаблівы «еўразійскі» тып, заснаваны на спалучэнні культур усх. славян і турынскіх народаў (угра-фінаў, самаедаў, цюркскіх народаў, манголаў і маньчжураў), і не адносіцца ні да «рамана-германскай», ні да славянскай культур. Выступаў за карэнны пераварот у паліт. і нац. еўрапеізаванай свядомасці рус. народа, самабытны «еўразійскі» шлях яго эвалюцыі. Погляды Т. паўплывалі на развіццё лінгвістыкі, фарміраванне лінгвакультуралогіі, этнасацыялогіі, рус. геапаліт. даследаванняў.

Тв.: Рус. пер. — Избр. тр. по филологии. М., 1987; История. Культура. Язык. М., 1995; Наследие Чингисхана. М., 1999; Основы фонологии. 2 изд. М., 2000.

Літ.: Н.С.Трубецкой и современная филология: [Сб. ст.]. М., 1993. *Н.Г.Кісялёва.*

ТРУБЯЦКО́Й Павел (Паола) Пятровіч (15.2.1866, Інтра, Італія — 12.2.1938), рускі скульптар-імпрэсіяніст. Працаваў у прыватных студыях (1884) і асабістай майстэрні (1885—97) у Мілане. У 1897—1906 жыў у С.-Пецярбургу і Маскве (выкладаў у Маскоўскім вучылішчы жывапісу, скульптуры і архітэктуры). З 1906 у Францыі, ЗША, Італіі. Ствараў пераважна жанравыя і партрэтныя статуэткі, партрэтныя бюсты ў тэхніцы лепкі экспрэсіўнымі раздзельнымі мазкамі, якія часта захоўвалі адбіткі пальцаў скульптара на сырой гліне. Работы вылучаюцца жывапіснай, пластычнай формай, багатай святлоценявымі эфектамі: «Маскоўскі рамізнік» (1898), «Партрэт Л.Талстога», «І.І.Левітан» (абодва 1899). Аўтар помніка Аляксандру III у С.-Пецярбургу (1900—06).

ТРУБЯЦКО́Й Сяргей Мікалаевіч (4.8.1862, маёнтак Ахтырка пад Масквой — 12.10.1905), расійскі філосаф і грамадскі дзеяч. Брат Я.М.*Трубяцкога*, бацька М.С.*Трубяцкога*. Д-р філасофіі (1900). Скончыў Маскоўскі ун-т (1885), дзе з 1900 працаваў праф., з 1905 рэктарам. У 1900—05 супрацоўнічаў у час. «Вопросы философии и психологии». Адстойваў ідэю універсітэцкай аўтаноміі, актыўна ўдзельнічаў у *земскім руху*. Для яго філас. поглядаў характэрна спалучэнне ідэй платанізму і хрысціянства, асновай якіх ён лічыў вучэнне пра Логас. Філас. вучэнне Т. — ‘канкрэтны ідэалізм» — выкладзена ў яго працы «Асновы ідэалізму» (1896), дзе ў якасці



П.**Трубяцкой**. І.І.Левітан. 1899.

зыходнага пункта выступае не абстрактная ідэя «чыстага быцця», а канкрэтнае існае. Прызнаваў духоўную прыроду рэальнасці; лічыў, што існае грунтуецца на разумных законах касмічнага Логаса, які ўпарадкоўвае развіццё прыроды і чалавечага грамадства; што існае папярэднічае мысленню, таму што вечная актуальная свядомасць (свядомасць Бога) папярэднічае канечнай свядомасці чалавека, якая знаходзіцца ў працэсе станаўлення. Сродкамі пазнання побач з розумам абвяшчаў вопыт і веру, якую трактаваў у адпаведнасці з правасл. традыцыяй: лічыў, што яна не супрацьстаіць розуму, а ўтварае з ім пэўнае адзінства. Аб'ектыўнасць свядомасці звязваў з ідэяй саборнасці. Саборнасць у разуменні Т. — пэўны агульначалавечы ідэал дасканалага грамадства, дзе пануе любоў як агульны найвышэйшы сінтэз сац., маральных і рэліг. прынцыпаў праваслаўя.

Тв.: Соч. М., 1994; Курс истории древней философии. М., 1997. *В.І.Боўш.*

ТРУБЯЦКО́Й Сяргей Пятровіч (9.9.1790, г. Ніжні Ноўгарад, Расія — 4.12.1860), дзекабрыст, князь, палкоўнік. З роду *Трубяцкіх*. Служыў з 1808 у Сямёнаўскім, з 1821 — у Праабражэнскім палках. Удзельнік вайны 1812, замежных паходаў рус. арміі 1813—14. Адзін з заснавальнікаў тайных таварыстваў — *«Саюза выратавання», «Саюза працвітання», Паўночнага таварыства дзекабрыстаў*. Спачатку прыхільнік канстытуцыйнай манархіі, потым — рэспублікі, у перагаворах з кіраўнікамі Паўд. т-ва дзекабрыстаў даў згоду на агульнае выступленне ў 1826. Напярэдадні выступлення дзекабрыстаў выбраны дыктатарам — кіраўніком рэвалюц. войск, але 26.12.1825 на Сенацкую плошчу не з'явіўся, бо лічыў паўстанне недастаткова падрыхтаваным. Прыгавораны Вярхоўным судом да пакарання смерцю, заменена вечнай катаргай, якую адбываў у Нерчынскіх капальнях і Чыцінскай турме. З 1839 на пасяленні ў Іркуцкай губ. У 1856 амністыраваны. Аўтар «Запісак» (1906).

ТРУБЯЦКО́Й Яўген Мікалаевіч (5.10.1863, Масква — 23.1.1920), расійскі філосаф, правазнавец і грамадскі дзеяч. Брат С.М.*Трубяцкога*. Д-р філасофіі (1897). Скончыў Маскоўскі ун-т (1885). З 1892 у Кіеўскім ун-це (з 1897 праф.), з 1905 праф. Маскоўскага ун-та. Адзін з заснавальнікаў канстытуцыйна-дэмакр. партыі (выйшаў з яе ў 1905). У 1906—10 гал. рэдактар час. «Московский еженедельник». У 1907—08 чл. Дзярж. савета. Адзін з заснавальнікаў выд-ва «Шлях» (1910—17). Пасля Кастр. рэвалюцыі 1917 адзін з ідэолагаў белага руху. Яго філас. погляды склаліся пад уплывам «філасофіі ўсеадзінства» У.С.*Салаўёва*. Гнасеалагічная канцэпцыя Т. грунтуецца на ідэі існавання абсалютнай звышіндывід. свядомасці, якая змяшчае вечныя ісціны і ўяўляе сабой сінтэз часовага і вечнага. Крытэрыем аб'ектыўнасці пазнання чалавека лічыў яго здольнасць да пераадолення фрагментарнасці індывід. ведаў і набліжэння да абсалютнай свядомасці («Метафізічныя перадумовы пазнання: Спроба пераадолення Канта і кантыянства», 1917). Сцвярджаў, што свет адносна незалежны ад Бога, таму што, паводле Божай ідэі, надзелены свабодай волі («Сэнс жыцця», 1918). На яго думку, свет з'яўляецца месцам самавызначэння асобы, ажыццяўлення яе свабоды выбару паміж 2 магчымасцямі: станоўчай (імкненне да рэалізацыі Божай ідэі) і адмоўнай (супраціўленне і процідзеянне Божай ідэі). Абсалютызацыя ролі свабоды асобы характэрна і для яго правазнаўчых поглядаў. Вызначаў права як сукупнасць норм, якія забяспечваюць і адначасова абмяжоўваюць знешнюю свабоду асобы. Права, на яго думку, з'яўляецца гал. фактарам узнікнення цывілізацыі. Абгрунтаваў неабходнасць гіст. падыходу да вывучэння права, які ўлічвае эвалюцыю ўласцівых розным народам на розных гіст. этапах уяўленняў пра межы свабоды асобы і ідэальную пабудову грамадства. Яго погляды паўплывалі на развіццё рус. рэліг. філасофіі (М.А.Бярдзяеў, С.М.Булгакаў, П.А.Фларэнскі і інш.).

Тв.: Три очерка о русской иконе. М., 1991; Смысл жизни. М., 1994; Избранное. М., 1995; Миросозерцание В.С.Соловьева. Т. 1—2. М., 1995; Из прошлого: Воспоминания. Из путевых заметок беженца. Томск, 2000; Труды по философии права. СПб., 2001.

Н.Г.Кісялёва.

«ТРУД», грамадска-палітычная газета. Выдаецца з 19.2.1921 у Маскве на рус. мове 6 разоў на тыдзень. Асвятляе пытанні грамадска-паліт., эканам. і культ. жыцця Расіі, міжнар. падзеі. Мае рубрыкі: «Падзеі і каментарыі», «Свет сёння», «Культура», «Дзелавая інфармацыя», «Рэпарцёр», «Абставіны і мы» і інш. Выходзіць штотыднёвы выпуск «Труд-7», у якім змяшчаюцца інфарм. матэрыялы і па Беларусі.

ТРУДАВІКІ́, «Працоўная група», фракцыя дэпутатаў-сялян і народніцкай інтэлігенцыі ў 1—4-й *Дзяржаўных думах* Расіі (1906—17). У 1-й Думе паводле розных звестак было 107 або 127 дэпутатаў з 478. Ад бел. губерняў у іх лік уваходзілі К.К.Александровіч, М.С.Гатавецкі (Віленская губ.), Ф.Я.Буслаў (Магілёўская губ.), М.М.Жукоўскі, С.П.Кандрашук, У.Р.Якубсон (Гродзенская губ.), Ф.С.Трасун, Р.П.Філіпаў (Віцебская губ.). Праграма: увядзенне дэмакр. свабод, нацыяналізацыя мірным шляхам зямлі (акрамя сял. надзелаў) і яе ўраўняльнае размеркаванне паводле прац. норм (адсюль назва «Т.»), адмена саслоўных і нац. абмежаванняў. Друкаваны орган — газ. «Трудовой народ». Па асобных пытаннях Т. блакіраваліся з кадэтамі і сацыял-дэмакратамі. 5.6.1906 яны выступілі ў Думе з «Праектам асн. палажэння» аб агр. рэформе, у якім патрабавалі адчужэння на карысць сялян памешчыцкіх і інш. прыватных зямель, што перавышалі «прац. норму». Т. адмовіліся падтрымаць *сталыпінскую аграрную рэформу* 1906—17, а ў 2-й Дзярж. думе (сак.—чэрв. 1907, 104 дэп. з 518) зноў унеслі свой агр. законапраект. З усталяваннем *«трэцячэрвеньскай манархіі»* і ўвядзеннем рэакц. выбарчага закона (1907) колькасны склад (14 дэп. у 3-й Думе 1907—12 і 10 дэп. у 4-й 1912—17) і ўплыў Т. рэзка скараціліся. Пасля Лют. рэвалюцыі 1917 яны падтрымлівалі *Часовы ўрад*, куды з сак. 1917 уваходзіў іх кіраўнік А.Ф.*Керанскі* (з ліп. 1917 прэм'ер-міністр). У ліп. 1917 Т. аб'ядналіся з *народнымі сацыялістамі* ў Прац. народна-сацыяліст. партыю.

ТРУДО́ (Trudeau) П'ер Эліёт (18.10.1919, г. Манрэаль, Канада — 28.9.2000), канадскі паліт. і дзярж. дзеяч. Ганаровы д-р права. Скончыў Манрэальскі ун-т. У 1949—51 працаваў у апараце прэм'ер-міністра. З 1961 праф. Манрэальскага ун-та. З 1965 чл. Ліберальнай партыі (у 1968—70 і 1976—79 яе лідэр), дэп. палаты абшчын федэральнага парламента Канады (да 1984). У 1966 парламенцкі сакратар прэм'ер-міністра. У 1967—68 міністр юстыцыі ва ўрадзе Л.Б.*Пірсана* і ген. пракурор Канады. У 1968—79 і 1980—84 прэм'ер-міністр Канады. Урад Т. дамогся заканад. замацавання англа-франц. двухмоўя ў краіне (1969) і незалежнасці Канады ад брыт. парламента (1982). Аўтар кніг грамадска-паліт. тэматыкі.

ТРУДЫ́, вёска ў Полацкім р-не Віцебскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 57 км на ПнУ ад г. Полацк, 165 км ад Віцебска, 14 км ад чыг. ст. Алешча. 148 ж., 77 двароў (2002). 2 лясніцтвы. Сярэдняя школа-сад, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, аддз. сувязі. Вайсковыя могілкі воінаў і партызан, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан.

ТРУЙМЯ́СТА (Trójmiasto), Трохграддзе, гарадская агламерацыя на Пн Польшчы, на ўзбярэжжы Балтыйскага мора. Уключае гарады *Гданьск, Гдыня, Сопат*, суседнія невял. гарады і пасёлкі.

ТРУМ (ад галанд. 't ruim), памяшканне ўнутры корпуса *судна* пад ніжняй палубай. Знізу Т. абмяжоўваецца днішчам або другім дном (воданепранікальным насцілам, які прырварваецца да верхніх кантаў днішчавага набору).

ТРУ́МБІЧ (Trumbić) Антэ (17.5.1864, г. Спліт, Харватыя — 17.11.1938), харвацкі і югаслаўскі паліт. дзеяч. Д-р права (1890). Вучыўся ва ун-тах Заграба, Вены і Граца (Аўстрыя). З 1894 чл. харвацкай (далмацінскай) Партыі права. У 1895—1918 дэп. Далмацінскага сабора і аўстр. парламента. Заснавальнік ліберальна-бурж. Харвацкай партыі (1905), якая выступала за харвацка-сербскае збліжэнне.

жэнне. З 1915 старшыня *Паўднёваславянскага камітэта*; ад яго імя падпісаў *Корфскую дэкларацыю 1917* аб стварэнні Каралеўства сербаў, харватаў і славенцаў (з 1929 Югаславія), міністрам замежных спраў якога быў у 1918—20.

ТРУ́МПІЦКАЕ ВО́ЗЕРА. У Пастаўскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Галбіца, за 26 км на ПнУ ад г. Паставы. Пл. 0,44 км^2, даўж. 1,4 км, найб. шыр. 570 м, найб. глыб. 4 м, даўж. берагавой лініі 3,86 км, пл. вадазбору 8,6 км^2. Катлавіна тэрмакарставага тыпу. Схілы выш. 6—8 м (на ПнУ 2—3 м), разараныя. Участкамі тэраса выш. 1,2—1,4 м. Берагі нізкія пясчаныя і пясчана-галечныя, пад хмызняком, месцамі на Пд сплавінныя; 3 залівы. На Пд і ПдЗ пераўвільготненая пойма шыр. да 50 м. Дно ілістае, на невял. участку каля ўсх. берага — пясчанае. Паласа надводнай расліннасці шыр. да 10 м. Выцякае ручай у р. Галбіца.

ТРУ́МЭН (Truman) Гары Спенсер (8.5.1884, Ламар, штат Місуры, ЗША — 26.12.1972), палітычны і дзярж. дзеяч ЗША. Быў



Г.С.**Трумэн**.

клеркам, бухгалтарам, фермерам, саўладальнікам магазіна. Удзельнік 1-й сусв. вайны на тэр. Францыі, капітан. Пасля вайны чл. Дэмакр. партыі. З 1926 старшыня акруговага суда ў штаце Місуры. З 1934 сенатар ад гэтага штата. Са студз. 1945 віцэ-прэзідэнт ЗША у адміністрацыі Ф.Д.*Рузвельта*, пасля яго смерці прэзідэнт краіны ад Дэмакр. партыі (1945—53; выбраны ў 1948). Урад Т. з 1946 канфрантаваў з пануючымі ў кангрэсе ЗША прадстаўнікамі Рэсп. партыі, з 1949 працягваў рэформы ў духу «новага курсу» Рузвельта, але абмяжоўваў дзейнасць прафсаюзаў паводле *Тафта—Хартлі закона*. У час *Патсдамскай канферэнцыі 1945* Т. загадаў скінуць ядз. бомбы на яп. гарады *Хірасіму* і *Нагасакі* (6 і 9.8.1945). Пасля 2-й сусв. вайны імкнуўся процідзейнічаць пашырэнню сферы ўплыву СССР у свеце, дзеля чаго былі прыняты *Трумэна дактрына* і *Маршала план*, засн. *Цэнтральнае разведвальнае ўпраўленне* і *Арганізацыя Паўночнаатлантычнага дагавора*, войскі ЗША удзельнічалі ў *карэйскай вайне 1950—53*. Аўтар мемуараў.

Літ.: Манькин А.С. «Эра демократов»: партийная перегруппировка в США, 1933—1952. М., 1990.

ТРУ́МЭНА ДАКТРЫ́НА, праграма знешнепаліт. дзейнасці ўрада ЗША, сфармуляваная прэзідэнтам Г.С.*Трумэнам* у яго пасланні кангрэсу 12.3.1947 на пач. *«халоднай вайны»*. Прадугледжвала дапамогу Грэцыі і Турцыі ў барацьбе супраць «камуніст. пагрозы» (400 млн. дол., адпраўка амер. ўзбраення і ваен. саветнікаў); абвяшчэнне гал. задачай знешняй палітыкі ЗША ўсялякай абароны дэмакр. ін-таў «свабоднага свету» ад замахаў на яго асновы, г.зн. падтрымку ўсіх народаў, што змагаліся супраць камунізму. Т.д. папярэднічала аказанню ўрадам ЗША эканам. дапамогі краінам Зах. Еўропы паводле *Маршала плана* ў 1948—52.

Літ.: Уткин А.И. Стратегия глобальной экспансии: Внешнеполитич. доктрины США. М., 1986.

ТРУ́ПА (ням. Truppe ад франц. troupe літар. — натоўп), творчы калектыў тэатра. Бываюць драм., оперныя, балетныя, аперэтачныя і інш. Т., а таксама змешаныя, якія складаюцца з акцёраў драмы, аперэты і інш.

ТРУ́ПА ГАЛУБКА́, Трупа беларускіх артыстаў пад загадам У.Галубка, гл. Беларускі трэці дзяржаўны тэатр.

ТРУПАЕ́ДЫ, жывёлы, якія кормяцца рэшткамі мёртвых арганізмаў, гл. ў арт. *Некрафагі*.

ТРУС дзікі еўрапейскі (Oryctolagus cuniculus), млекакормячая жывёла сям. зайцавых атр. зайцападобных. Адзіны від роду. Паходзіць з Цэнтр. і Паўд. Еўропы, Паўн.-Зах. Афрыкі. У сярэдневякоўі завезены ў шэраг краін Еўропы, пазней у Аўстралію, Новую Зеландыю, Амерыку. Жыве вял. калоніямі ў хмызняковых зараснікаў, у норах. Родапачынальнік парод свойскіх Т. (гл. *Трусагадоўля*). Т. называюць таксама 3 інш. роды сям.: амерыканскіх Т. — Sylvilagus (14 відаў); бясхвостых Т. — Romerolagus (1 від); паўднёваамерыканскіх Т. — Pronolagus (3 віды).

Даўж. да 55 см, маса да 2,5 кг. Афарбоўка шэрая з бураватымі ці вохрыстымі адценнямі, брушка белае. Вушы адносна кароткія (даўж. да 7 см), закругленыя. Пераважна расліннаедны. Палігам. Нараджае да 9 (макс. 12) дзіцянят 3—7 разоў за год. Аб'ект палявання. Лабараторная жывёла. *А.М.Петрыкаў.*

ТРУС Анатоль Міхайлавіч (30.5.1910, в. Нізок Уздзенскага р-на Мінскай вобл. — 7.9.1989), бел. акцёр. Нар. арт. Беларусі (1955). Скончыў Віцебскі маст. тэхнікум (1930), студыю БДТ-2 (1931). Працаваў у Бел. т-ры імя Я.Коласа (да 1986). У сваёй творчасці працягваў і развіваў лепшыя традыцыі нац. сцэны. Адметны мастакоўскі тэмперамент спалучаў у сцэн. партрэтах сваіх герояў з псіхал. заглыбленасцю, выразным пластычным малюнкам, унутр. засяроджанасцю. Шырокі творчы дыяпазон, мастацтва пераўвасаблення даваліяму магчымасць выявіць сваю індывідуальнасць у разнапланавых ролях (лірычных і сац. герояў, драм., камед., востраха рактарных) у творах розных жанраў. Яркія прыклады рэаліст. і памастацку вобразнага раскрыцця змястоўных характараў і тыпаў пададзены ім у класічным і сучасным, у т.л. бел., рэпертуары: Старац («Раскіданае гняздо» Я.Купалы), Мацей («Несцерка» В.Вольскага), Бондараў («Проба агнём» К.Крапівы), Полаз, Шыковіч («Крыніцы», «Сэрца на далоні» паводле І.Шамякіна), Крандзялёў («Таблетку пад язык» А.Макаёнка), Макаранка («Над Бярозай-



1



2



3

Трусы: 1 — дзікі еўрапейскі; 2 — амерыканскі балотны; 3 — амерыканскі трус-пігмей.

ракой» П.Глебкі), Мітрыч («Улада цемры» Л.Талстога), Андрэй Прозараў («Тры сястры» А.Чэхава), Ляпкін-Цяпкін («Рэвізор» М.Гогаля), Захар Бардзін, Басаў, Шышкін («Ворагі», «Дачнікі», «Мяшчане» М.Горкага), Пераяркаў, Пётр («Багна», «Лес» А.Астроўскага). Сярод інш. значных роляў: Макар («Востраў Алены» Я.Шабана), Гоша («Цудоўны сплаў» У.Кіршона), Месны («Фронт» А.Карнейчука), Карп Карпавіч («Не называючы прозвішчаў» В.Мінко), Яўмен Дыбенка («Праўда і крыўда» паводле М.Стэльмаха), Лір («Кароль Лір» У.Шэкспіра), Маёр («Дамы і гусары» А.Фрэдры), Эрнст фон Мюлер («Гарачае лета ў Берліне» паводле Дз.К'юсак).

Літ.: Гуткавіч А. Акцёр сцэнічнага натхнення (А.М.Трус) // Майстры беларускай сцэны. Мн., 1960. *Б.І.Бур'ян.*



А.М.**Трус**.



П.**Трус**.

ТРУС Паўлюк (Павел Адамавіч; 6.5.1904, в. Нізок Уздзенскага р-на Мінскай вобл. — 30.8.1929), бел. паэт. Скончыў Мінскі белпедтэхнікум (1927), вучыўся ў БДУ (1928—29). У 1927—28 працаваў у рэд. газ. «Палеская праўда» (Гомель).

Друкаваўся з 1922. У яго вершах (зб-кі «Вершы», 1925; «Ветры буйныя», 1927), паэмах («Юны змаганец» і «Астрожнік», 1925; «Дзесяты падмурак», 1928; «Чырвоныя ружы», 1929; «Сірата Алеся», часткова апубл. 1925—29, цалкам 1934 і інш.) адлюстраваны пераўтварэнні ў краіне. Узбагаціў змест і маст.-выяўл.



А.**Трус** (у цэнтры) у ролі Макара.

сродкі плакатна-агітацыйнага верша. Пісаў сатыр. вершы, прыпеўкі, гумарыст. вершаваныя апавяданні. Паэзія Т. прасякнута рэв. рамантыкай. Яго паэмы вызначаюцца лірычным ладам, задушэўнай узрушанасцю. Адзін з першых у бел. паэзіі спалучыў у лірыцы патэтыку з унутр. перажываннем.

Тв.: Зб. тв. Мн., 1934; Выбр. творы. Мн., 1953; Выбранае: Вершы і паэмы. Мн., 1979; Новай квадры настаў маладзік. Мн., 1984; Выбр. творы. Мн., 2000.

Літ.: Чорны К. Думкі пра Паўлюка Труса // Зб. тв. Мн., 1975. Т. 8; Лужанін М. Вобраз юнака // Зб. тв. Мн., 1981. Т. 4; Глебка П. Паэзія барацьбы і перамогі. Мн., 1973. С. 166—172; Гарэлік Л. Паўлюк Трус // Беларускія пісьменнікі і літаратурны працэс 20—30-х гг. Мн., 1985.

Л.М.Гарэлік.

ТРУС СВО́ЙСКІ, млекакормячае атр. зайцападобных. Паходзіць ад *труса* дзікага еўрапейскага. Вядома каля 60 парод, якія падзяляюцца на мяса-шкуркавыя (*белы волат, венскі блакітны трус, матылёк, савецкая шыншыла, савецкі мардэр, серабрысты трус, чорна-буры трус, шэры волат* і інш.), мясныя (новазеландскі белы, каліфарнійскі, блакітны беверэн, дацкі фламандскі волат) і пуховыя (пароды ангорская, белая пуховая). Вылучаюць пароды буйныя (больш за 4,5 кг), сярэднія (3—4,5 кг) і дробныя (менш за 3 кг).

Даўж. да 70 см. Афарбоўка шэрсці белая, блакітная, шэрая, карычневая, серабрыстая, чорная. Жывуць да 10 гадоў, гасп. выкарыстанне 1—1,5 года. Нараджаюць па 8 і больш дзіцянят 3—6 разоў за год.

ТРУ́САВА Ірына Аляксандраўна (н. 22.3.1957, г. Архангельск, Расія), бел. вучоны ў галіне металургіі. Канд. тэхн. н. (1988). Скончыла Днепрадзяржынскі індустрыяльны ін-т (1983). З 1984 у Бел. нац. тэхн. ун-це. Навук. працы па цеплафізіцы і цеплаэнергетыцы высокатэмпературных тэхналогій у металургіі і машынабудаванні. Дзярж. прэмія Беларусі 1998. Прэмія Ленінскага камсамола Беларусі 1988.

Тв.: Кольцевые печи: Теория и расчеты. Мн., 1993 (разам з У.І.Цімашпольскім, М.Я.Пякарскім); Промышленные теплотехнологии. Ч. 1—5. Мн., 1995—2000 (у сааўт.); Стальной слиток. Т. 1—3. Мн., 2000—2001 (у сааўт.).

ТРУСАГАДО́ЎЛЯ, галіна *жывёлагадоўлі* па развядзенні *труса свойскага* для атрымання мяса, шкурак і пуху. Вылучаюць кірункі Т.: мяса-шкуркавы, мясны, пуховы. Трусінае мяса — пажыўны дыетычны прадукт, шкуркі — каштоўная сыравіна для футравай прам-сці, пух ідзе на выраб фетру і трыкатажу. Сістэмы ўтрымання трусоў: клетачная, вонкавая шэдавая, таксама ў закрытых трусятніках для прамысл. Т. з рэгуляваным мікракліматам і механізацыяй працэсаў іх кармлення, паення і прыбірання гною. На Беларусі развіта Т. аматарская.

Літ.: Кулько К.С. Разведение кроликов. 2 изд. М., 1984; Помытко В.Н. Зоотехнические основы промышленного кролиководства. М., 1984; Тузова Р.В., Иванова Е.И. Кролиководство. Мн., 1987; Ерин А.Т., Плотников В.Г., Рыминская Е.И. Приусадебное кролиководство и нутриеводство. 2 изд. Мн., 1994.

ТРУ́САЎ Алег Анатолевіч (7.8.1954, г. Мсціслаў Магілёўскай вобл.), бел. археолаг і гісторык архітэктуры, грамадскапаліт. дзеяч. Канд. гіст. н. (1981), дацэнт (2001). Скончыў БДУ (1976). З 1976 супрацоўнік, з 1980 начальнік археал. аддзела Бел. рэстаўрацыйнага праектнага ін-та. З 1995 у Бел. ун-це культуры (у 1996—98 дэкан ф-та бібліятэчна-інфармацыйных сістэм). Вывучае помнікі манум. дойлідства, матэрыяльную культуру Беларусі 11—18 ст. Распрацаваў методыку арх.-археал. вывучэння манум. помнікаў Беларусі. Праводзіў раскопкі помнікаў археалогіі і архітэктуры ў шэрагу бел. гарадоў. У 1990—96 дэп. Вярх. Савета Рэспублікі Беларусь. У 1991—96 нам. старшыні Камісіі Вярх. Савета па адукацыі, культуры і захаванні гіст. спадчыны. У 1992—95 старшыня, 1998—99 нам. старшыні Цэнтр. рады Бел. с.-д. грамады. З 1999 старшыня Т-ва бел. мовы імя Ф.Скарыны.

Тв.: Памятники монументального зодчества Белоруссии XI—XVII вв.: Архитектурно-археол. анализ. Мн., 1988; Старажытны Мсціслаў. Мн., 1992 (разам з М.А.Ткачовым); Беларускае кафлярства. Мн., 1993; Стары замак у Гродне XI — XVIII стст. Мн., 1993 (разам з В.Е.Собалем, Н.І.Здановіч); Матэрыяльная культура Міра і Мірскага замка. Мн., 1994 (разам з Н.І.Здановіч, А.К.Краўцэвічам); Манументальнае дойлідства Беларусі XI—XVIII стст.: Гісторыя будаўнічай тэхнікі. Мн., 2001.

ТРУ́САЎ Антон Данілавіч (27.5.1835, г. Барысаў Мінскай вобл. — 1886?), бел. рэвалюцыянер-дэмакрат, адзін з кіраўнікоў паўстання 1863—64 на Беларусі, дзеяч міжнар. рэв. руху, выдавец. Брат Б.К.Д. *Трусава*. Скончыў Мінскую гімназію (1853), вучыўся ў Маскоўскім ун-це (1854—56; 1860—61). Паслядоўнік М.Г.Чарнышэўскага і К.Каліноўскага. У 1861—62 рыхтаваў паўстанне ў Мінску. У 1863 узначаліў паўстанцкі атрад з жыхароў Мінска, удзельнічаў у баях супраць урадавых войск у Мінскай губ. Пасля паўстання ў эміграцыі. У Жэневе зблізіўся з рус. рэвалюцыянерам М.І.Уціным, арганізаваў з ім і інш. рэвалюцыянерамі Рус. секцыю 1-га Інтэрнацыянала (1870). У 1871 чл. Жэнеўскага к-та дапамогі парыжскім камунарам. Адзін з арганізатараў друкарні час. «Народное дело», у 1869—71 яе загадчык, з 1873 уладальнік. У 1884 прадаў друкарню групе «Вызваленне працы» і вярнуўся ў Мінск, дзе жыў пад наглядам паліцыі.

Літ.: Кісялёў Г. Сейбіты вечнага. Мн., 1963. *Г.В.Кісялёў.*

ТРУ́САЎ Баляслаў Канстанцін Данілавіч (1832 ці 1833, г. Барысаў Мінскай вобл. — пасля 1866), удзельнік вызв. руху 1860-х г. Брат А.Д. *Трусава*. Скончыў Мінскую гімназію, Маскоўскі пед. ін-т (1853). Настаўнічаў у Маскве. Быў блізкі да рэв. т-ва М.І.Ішуціна, чл. польск. падп. к-та ў Маскве, які дапа-

магаў удзельнікам паўстання 1863—64. У 1866 арыштаваны і зняволены ў Петрапаўлаўскую крэпасць па т.зв. «каракозаўскай справе» (замах на цара Аляксандра II). На следстве выявілася дачыненне Т. да ўцёкаў Я.Дамброўскага з-пад варты ў Маскве (1864) і да планаў рэвалюцыянераў арганізаваць уцёкі М.Г.Чарнышэўскага з Сібіры. Аднак у поўным аб'ёме сувязі Т. з падполлем не былі раскрыты. У снеж. 1866 вызвалены пад нагляд паліцыі. Далейшы лёс невядомы.

Літ.: Кісялёў Г. Сейбіты вечнага. Мн., 1963; Русско-польские революционные связи. Т. 2. М., 1963. *Г.В.Кісялёў.*

ТРУ́САЎ Сцяпан Пятровіч (1803?—?), дзекабрыст, прапаршчык Палтаўскага пях. палка. У 1824 прыняты ў Т-ва з'яднаных славян. 18.2.1826 у Бабруйску ў час агляду Палтаўскага палка заклікаў салдат узняцца на барацьбу супраць царызму. Арыштаваны і закаваным у кайданы дастаўлены ў Магілёў, але ваенна-судовая камісія вырашыла судзіць яго пры Палтаўскім палку. На следстве не прызнаўся ў прыналежнасці да тайнага т-ва і нікога не выдаў. Прыгавораны да смяротнага пакарання, якое заменена пажыццёвай катаргай. Пакаранне адбываў у Бабруйскай крэпасці. У 1863 пераведзены ў разрад «тэрміновых вязняў». Далейшы лёс невядомы.

Літ.: Швед В.В. Беларускія старонкі гісторыі дзекабрыстаў. Мн., 1998. *В.В.Швед.*

ТРУСЕ́ВІЧ Барыс Іпалітавіч (5.8.1892, г. Віцебск — 14.11.1961), бел. вучоны ў галіне ўнутр. медыцыны. Акад. АН Беларусі (1956, чл.-кар. 1953), д-р мед. н. (1943), праф. (1934). Засл. дз. н. Беларусі (1946). Скончыў Кіеўскі ун-т (1916), дзе працаваў у 1918—20. З 1928 у БДУ, з 1930 у Мінскім мед. ін-це (з 1943 заг. кафедры), адначасова заг. кафедры Бел. ін-та ўдасканалення ўрачоў. У 1952—54 гал. тэрапеўт Мін-ва аховы здароўя Беларусі. Навук. працы па пытаннях паталогіі сардэчна-сасудзістай сістэмы, лёгкіх, страваваль-на-кішачнага тракту і інш. Распрацаваў методыку пальпацыі нырак.

Тв.: Материалы к проблеме острой сосудистой недостаточности. Мн., 1950; Примерный план обследования больного в терапевтической клинике. 4 изд. Мн., 1961.

Літ.: Балышева М.Н. Б.И.Трусевич: (К 100-летию со дня рождения) // Здравоохранение Беларуси. 1992. № 9.

ТРУСЕ́ВІЧ Станіслаў Станіслававіч (псеўд. Залеўскі Казімір; 1870, в. Вераскава Навагрудскага р-на Гродзенскай вобл. — 25.8.1918), дзеяч рэв. руху на Беларусі, у Польшчы і Літве, публіцыст. Вучыўся ў Варшаўскім вет. ін-це (у 1889 выключаны за ўдзел у студэнцкіх хваляваннях). У 1891—92 вёў прапаганду сярод настаўнікаў і сялян Навагрудскага, Лідскага, Слуцкага пав. Сасланы пад нагляд паліцыі ў Мінск, дзе ў 1894 пад яго кіраўніцтвам створана Мінская с.-д. арг-цыя. Адзін з заснавальнікаў *Рабочага саюза Літвы, Сацыял-дэмакратыі Каралеўства Польскага і Літвы*, у 1900—01 чл. яе Гал. праўлення. За рэв. дзейнасць неаднойчы арыштаваны і сасланы. З 1906 у эміграцыі. Пасля Лют. рэвалюцыі 1917 вярнуўся ў Расію. У 1917—18 заг. аддзела газ. «Известия ВЦИК», рэдактар час. «Вестник жизни». Друкаваўся ў «Правде». У зб. «Грамадскі рух у Расіі ў пачатку XX ст.» (кн. 7, т. 4, ч. 2, 1911) змясціў арт. «Нацыянальны рух», у якім прыводзіў звесткі па гісторыі бел. культуры, мовы і л-ры, вітаў творчасць Ф.Багушэвіча,



Б.І.**Трусевіч**.



С.С.**Трусевіч**.

Я.Коласа, Я.Купалы. Аўтар брашуры «Мастацтва і пралетарыят» (1918), артыкулаў, у якіх з марксісцкіх пазіцый асвятляў ролю інтэлігенцыі ў развіцці пралет. руху. Пісаў пра творчасць паэта Э.Верхарна, скульптара К.Э.Менье, жывапісца Рафаэля і інш. *Э.А.Карніловіч.*

ТРУСКАВЕ́ЦЬ, горад на Украіне, у Львоўскай вобл., у перадгор'ях Карпат. Вядомы з 1462, горад з 1948. Каля 40 тыс. ж. (2001). Чыг. ст., вузел аўтадарог. З-д па разліве мінер. вады. Прадпрыемствы харч. прам-сці. Бальнеалагічны курорт. Засн. ў 1827 (першая бальнеалячэбніца). Клімат умерана кантынентальны. Асн. прыродны лек. фактар — мінер. крыніцы з хларыдна-сульфатна-натрыевымі водамі на піццё, ванны, інгаляцыі. Найб. вядомая вада «Нафтуся» (гідракарбанатна-кальцыева-магніевая слабамінералізаваная з высокім утрыманнем арган. рэчываў). Лечаць хваробы нырак, страўніка, печані і жоўцевых шляхоў, парушэнні абмену рэчываў. Санаторыі, пансіянаты, курортная паліклініка.

ТРУСКА́ЛКІ, кветкавая расліна, тое, што *клубніцы*.

ТРУСЫ́ (Oryctolagus), род млекакормячых атр. зайцападобных. Адзіны від — дзікі Т. (O.cuniculus). Пашыраны першапачаткова ў Цэнтр. і Паўд. Еўропе, Паўн.-Зах. Афрыцы; завезены ў шэраг краін Еўропы, пазней ў Аўстралію, Новую Зеландыю, Паўд. Амерыку. Сустракаюцца на ПдЗ Украіны і ў Малдове. Жывуць у норах на адкрытых месцах з кустовай расліннасцю, утвараюць калоніі. Кормяцца травяністай расліннасцю. Ад Т. паходзяць пароды *труса свойскага*.

Даўж. да 44 см, маса каля 2 кг. Асн. афарбоўка карычнева-шэрая. Нараджаюць 4—9 дзіцянят 3—7 разоў за год. Аб'ект палявання.

ТРУ́ТНЕЎ Іван Пятровіч (1827, г. Чакалін Тульскай вобл., Расія — 18.2.1912), рускі і бел. жывапісец, графік, педагог. Вучыўся ў Строганаўскім вучылішчы ў Маскве, Пецярбургскай АМ (1850—58; з 1868 акадэмік). У 1866—1912 арганізатар і загадчык *Віленскай школы маляванння*. Шмат зрабіў для развіцця маст. адукацыі на Беларусі. Працаваў у жанрах гіст. і быт., партрэта, пейзажа. Многія яго работы прысвечаны побыту бел. і літ. сялян. Творы вызначаюцца рэалістычнасцю, крытычным падыходам да адлюстравання рэчаіснасці. Выканаў замалёўкі шэрагу будынкаў Полацка, Віцебска, Мсціслава і інш., Ільінскай царквы ў Віцебску (змешчана ў кн. П.Бацюшкава «Беларусь і Літва», 1890). Сярод жывапісных твораў: «Бласлаўленне сына ў апалчэнне» (1855), «Хрэсны ход на вадохрышча ў вёсцы» (1857, вял.



І.**Трутнеў**. Аўтапартрэт.

залаты медаль), «Народная школа», «Партрэтная ў Антверпене» (1868), «Літоўская пагранічная карчма» (1889), «Віленскія пакутнікі Антоній і Іаан» (1880-я г.), «Сляпы кабзар», «На раку з бялізнай», «Рэвалюцыя 1905 года ў Вільні» і інш. Аўтар шэрагу партрэтаў (аўтапартрэт, партрэт М.Марцюшавай, 1901), абразоў, пейзажаў («Ручай», пач. 20 ст.), а таксама акварэлей, у якіх увасобіў гіст. помнікі і памятныя мясціны на Беларусі.

Літ.: Дробов Л.Н. Живопись Белоруссии XIX — начала XX в. Мн., 1974; Кацер М.С. Изобразительное искусство Белоруссии дооктябрьского периода: Очерки. Мн., 1969. *Б.А.Лазука.*

ТРУТО́ЎСКІ Канстанцін Аляксандравіч (9.2.1826, г. Курск, Расія — 29.3.1893), украінскі і рускі мастак. У 1845—49 вольнаслухач Пецярбургскай АМ, з 1860 яе акадэмік. Аўтар жанравых карцін, прасякнутых любоўю да народа:

«Карагод у Курскай губерні» (1860), «Калядкі на Украіне» (1864), «Збор нядоімак на сяле» (1886), «Бяленне палатна» (1874). Выканаў ілюстрацыі да паэм Т.Шаўчэнкі «Гайдамакі» (1886), «Нявольнік» (1887), баек І.Крылова (1864) і інш.



К.Трутоўскі. Бяленне палатна. 1874.

ТРУ́ФЕЛЕВЫЯ (Tuberales), парадак сумчатых грыбоў з групы парадкаў *дыскаміцэтаў*. Уключае 2—3 сям. (трыфелевыя, тэрфезіевыя, элафаміцэтавыя), больш за 100 відаў. Пашыраны пераважна ў зонах цёплага ўмеранага клімату Еўразіі і Амерыкі. Сапратрофы, Мікарызаўтаральнікі. Растуць у глебе пераважна ў дубровах, радзей у мяшаных лясах. Некат. ядомыя. На Беларусі трапляюцца 4 віды з родаў *труфель*, *гіднотрыя*, *стэфензія*.

ТРУ́ФЕЛЬ (Tuber), род дыскаміцэтаў сям. труфелевых. Каля 100 відаў. Пашыраны ва ўмераных зонах абодвух паўшар'яў. Утвараюць *мікарызу* з арэшнікам, букам, дубам, грабам. На Беларусі 1 від — Т.белаваты (T.borchii). Трапляецца ў мяшаных і лісцевых лясах у багатай перагноем глебе, пладаносіць са жн. па лістапад.

Пладовыя цялы падземныя, памерам ад ляснога арэха да буйнога клубня бульбы (маса да 1 кг), акруглыя, з гузаватай паверхняй, мясістыя ці храсткаватыя, пакрытыя звонку абалонкай (*перыдыем*). Міцэлій пры выспяванні пладовых цел знікае. Тканка грыба на разрэзе мае мармуровы малюнак з цёмных і светлых (на якіх размешчаны сумкі з 1—8 аскаспорамі) пражылак. Некат. Т. ядомыя: белаваты, зімовы (T.brumale), летні (T.aestivum) і інш. Найб. каштоўны Т. чорны (T.melanosporum) культывуюць у Францыі. З-за пладовых цел да Т. таксама адносяць грыбы інш. родаў [напр., *стэфензія*, гіднотрыя Цюляна (Hydnotria tulasnei), або Т. чырвона-буры].

ТРУ́ХАН Іван Іванавіч (11.12.1915, в. Каменка Бабруйскага р-на Магілёўскай вобл. — 16.6.2000), бел. вучоны ў галіне эканам. геаграфіі. Канд. геагр. н. (1949), праф. (1977). Скончыў Бел. ін-т нар. гаспадаркі (1938), Вышэйшую парт. школу (1946). У 1950—53 прарэктар, у 1962—65 рэктар Бел. ін-та нар. гаспадаркі. У 1965—67 дырэктар НДІ эканомікі і эканам.-матэм. метадаў. У 1953—62 і 1967—84 у БДУ. Навук. працы па геаграфіі сельскай гаспадаркі Беларусі. Аўтар падручнікаў і дапаможнікаў для ВНУ.

Тв.: География Белоруссии. Мн., 1965 (у сааўт.); Экономическая география Белоруссии. 2 изд. Мн., 1973.

ТРУХА́НАЎ Пётр Сцяпанавіч (16.6.1910, Рыга — 14.8.1992), Герой Сав. Саюза (1945). Беларус. У Вял. Айч. вайну з 1943 на 2-м Бел. фронце. Старшы сяржант Т. вызначыўся 27.6.1944 у баі каля в. Стайкі Магілёўскага р-на, дзе адным з першых фарсіраваў Дняпро, агнём з кулямёта забяспечыў пераправу роты, у крытычны момант бою закрыў сваім кулямётам амбразуру варожага дзота. Пасля вайны працаваў на чыгунцы.

ТРУХА́НАЎ Юрый Уладзіміравіч (8.12.1929, С.-Пецярбург — 2.2.1999), бел. акцёр Засл. арт. Беларусі (1980). Вучыўся ў Ленінградскім тэатр. ін-це (1953—55). З 1955 працаваў у рас. т-рах. У 1962—80 акцёр Магілёўскага абл. драм. т-ра. Выканаўца пераважна драм. і камед. роляў. Імкнуўся выявіць шматграннасць характараў, перадаць унутр. склад душы і своеасаблівасць знешняга аблічча. Сярод роляў у Магілёўскім т-ры: Каравай («Таблетку пад язык» А.Макаёнка), Хлынаў («Гарачае сэрца» А.Астроўскага), Ягор Булычоў («Ягор Булычоў і іншыя» М.Горкага), Прысыпкін («Клоп» У.Маякоўскага), Гадун («Разлом» Б.Лаўранёва), Віктар («Варшаўская мелодыя» Л.Зорына), Сцяпан Судакоў («Гняздо глушца» В.Розава), Лейстэр («Марыя Сцюарт» Ф.Шылера), Сагамор («Мільянерка» Б.Шоу) і інш.

Г.Р.Герштэйн.

ТРУХІ́ЛЬЁ (Trujillo), горад на З Перу. Адм. ц. дэпартамента Лібертад. Засн. ў 1534. Каля 600 тыс. ж. (2001). На Панамерыканскай шашы, вузел аўтадарог. Аэрапорт. Буйны цэнтр перапрацоўкі цукр. трыснягу, бавоўны, рысу, кавы. Прам-сць: харч., хім., гарбарная; вытв-сць эл.-абсталявання, буд. матэрыялаў. Ун-т. Тэатры, музеі, у т.л. археалагічны. Арх. помнікі 17—18 ст. Пацярпеў ад землетрасення ў 1970.

ТРУХЛЯКІ́ (Pythidae), сямейства жукоў падатр. разнаедных. Каля 300 відаў. Пашыраны ўсюды, акрамя Антарктыды. Жывуць пад карой пераважна хвойных дрэў. На Беларусі 2 віды, найб. трапляецца Т. плоскі (Pytho depressus).

Даўж. да 20 мм. Цела плоскае, чорнае з метал. зялёным, фіялетавым або чырв. бляскам; брушка, вусікі і ногі чырв.-карычневыя. Вусікі 11-членікавыя, ніткападобныя, патоўшчаныя на верхавінцы. Галава выцягнута ў галаваструбку. Кормяцца гніючым лубам, некат. драпежнікі. Лічынкі (даўж. да 30 мм) прадаўгаватыя, плоскія, карычняватыя або жоўтыя, з 2 вырастамі на заднім канцы цела. Развіццё ад яйца да імага некалькі гадоў.

С.Л.Максімава.

ТРУХНО́Ў Рыгор Ма́ркавіч (15.10.1908, в. Шамкі Крупскага р-на Мінскай вобл.— 26.11.1986), бел. гісторык. Д-р гіст. н. (1966), праф. (1967). Засл. работнік вышэйшай школы Беларусі (1982). Удзельнік Вял. Айч. вайны. Скончыў Мінскі пед. ін-т (1934). У 1934—38 настаўнічаў у Барысаве. З 1946 выкладаў у БДУ. Даследаваў гісторыю Германіі і сав.-герм. адносіны ў 1-й пал. 20 ст.

Тв.: Германский вопрос на Лондонской репарационной конференции (16 июля — 16 августа 1924 г.). Мн., 1959; Революционный подъем в Германии (конец 1918 — середина 1921 г.). Мн., 1963; Классовая борьба в Германии в 1922—1923 гг. Мн., 1969; Поучительные уроки истории: Три советско-германские договора (1922—1926 гг.). Мн., 1979; Рапалло в действии: Из истории советско-германских отношений (1926—1929 гг.). Мн., 1982.

П.М.Бараноўскі.

ТРУ́ЦЕНЬ, мужчынская асобіна *пчалы меданоснай*. Гл. ў арт. *Пчаліная сям'я*.

ТРУЦЭ́ВІЧ Іаіль (?—1654), бел. грамадскі і культ. дзеяч, друкар, пісьмен-



1 2 3 4

Труфелі: 1 — чорны; 2 — летні; 3 — афрыканскі; 4 — белаваты.

нік. Дзяцінства і юнацтва, верагодна, прайшлі ў Магілёве, дзе ён мог атрымаць адукацыю. Чл. Магілёўскага богаяўленскага брацтва (2-я чвэрць 17 ст.), ігумен Куцеінскага Богаяўленскага манастыра (г. Орша). Магчыма, у Магілёве пазнаёміўся з бел. друкаром і асветнікам С.*Собалем*. Удзельнічаў у заснаванні *Куцеінскай друкарні*, з сярэдзіны 1630-х г. яе кіраўнік. Да многіх нелітургічных выданняў напісаў прадмовы на бел. і царкоўнаслав. мовах. Пад яго рэдакцыяй выйшлі «Лексіконъ славеноросскій и именъ тлъкованіе» П.Бярынды (1653), «Трефологіонъ» (1647) і інш. Прыхільнік грамадска-палiт. і культ. сувязей з Рус. дзяржавай. Памёр у час пераезду друкарні ў Іверскі манастыр пад Ноўгарадам.

Літ.: Харлампович К.В. Малороссийское влияние на великорусскую церковную жизнь. Т. 1. Казань, 1914; Жудро Ф. Иоиль Трупевич, первый игумен кутеинских монастырей // Могилевские епархиальные ведомости. 1891. № 8—11.

Г.Я.Галенчанка.

ТРУШ Мікалай Мікалаевіч (н. 23.2.1948, в. Мосткі Драгічынскага р-на Брэсцкай вобл.), бел. матэматык. Д-р фіз.-матэм. н., праф. (2000). Скончыў БДУ (1972), дзе і працуе. Навук. працы па тэорыі імавернасці і матэм. статыстыцы. Распрацаваў метады пабудовы непараметрычных ацэнак мнагамерных стацыянарных выпадковых працэсаў і аднародных палёў, развіў семіінварыянтны падыход да даследаванняў стат. уласцівасцей гэтых ацэнак.

Тв.: Об оценке спектральных плотностей стационарных процессов (разам з І.Г.Журбенка) // Литовский мат. сб. 1979. Т. 19, № 1; О скорости сходимости моментов оценок спектральных плотностей (разам з Е.І.Мірскай) // Весці АН Беларусі. Сер. фіз.-мат. навук. 1996. № 4; Асимптотические методы статистического анализа временных рядов. Мн., 1999.

ТРУШКО́ Леанід Ігнатавіч (н. 4.3.1938, г. Орша Віцебскай вобл.), бел. акцёр. Нар. арт. Беларусі (1996). У 1967—99 акцёр Бел. т-ра імя Я.Коласа. Мастацтва Т. адметнае глыбінёй псіхал. распрацоўкі, быт. дакладнасцю, ідэйнай мэтанакіраванасцю вобразаў. Лепшыя ролі: Гапон («Залёты» В.Дуніна-Марцінкевіча), Дзерваед, Андрэй Буслай і Бацька («Радавыя», «Парог» А.Дударава), Сырадоеў («Трыбунал» А.Макаёнка), Салавейчык («Амністыя» М.Матукоўскага), Мацей («Несцерка» В.Вольскага), Мікіта («Улада цемры» Л.Талстога), Шохін, Цецераў («Зыкавы», «Мяшчане» М.Горкага), Лір («Кароль Лір» У.Шэкспіра), Эйліф («Матухна Кураж і яе дзеці» Б.Брэхта), Абель («Сола для гадзінніка з боем» О.Загрaдніка), Похрань («Гісторыя граху» паводле С.Жаромскага), Дзятлаў («Трэцяя патэтычная» М.Пагодзіна), Лагуцін («Сталявары» Г.Бокарава), Максім («Стары дом» А.Казанцава), Пятрэнка («Зінуля» А.Гельмана), герцаг Веронскі («Чума на вашы дзве сям'і» Р.Горына). З інш. роляў: Дарафей («Званы Віцебска» У.Караткевіча), Лапахін («Вішнёвы сад» А.Чэхава), смалакур Алялюмас [«Час быка» («Клеменс») К.Саі], Міларад («Доктар філасофіі» Б.Нушыча), Кэбат («Каханне пад вязамі» Ю.О'Ніла).

В.С.Іваноўскі.



Л.**Трушко** ў ролі Дзерваеда.



П.С.**Труханаў**.



Л.І.**Трушко**.

ТРУ́ШНІКАВА Лізавета Васілеўна (н. 9.9.1920, в. Курычанка Куртамышскага р-на Курганскай вобл., Расія), бел. вучоны ў галіне гінекалогіі. Д-р мед. н. (1976), праф. (1979). Скончыла 2-і Маскоўскі мед. ін-т (1943). У Вял. Айч. вайну ў хірург. шпіталі. З 1962 у БелНДІ анкалогіі і мед. радыялогіі (заг. аддзела), у 1971—92 у Мед. акадэміі паслядыпломнай адукацыі. Навук. працы па клініцы, дыягностыцы, лячэнні дабраякасных і злаякасных пухлін геніталій.

Тв.: О лечении рецидивов рака шейки матки после сочетанной лучевой терапии // Вопр. онкологии. 1966. Т. 12, № 1; Вопросы прогноза при рецидивах рака шейки матки в зависимости от локализации и методов лечения // Прогноз злокачественных опухолей. Л., 1968; Причины рецидивов и неудач после сочетанной лучевой терапии рака шейки матки // Актуальные проблемы онкологии и медицинской радиологии. Мн., 1970. Т. 2.

ТРУ́ШЫНА Тамара Васілеўна (15.12.1923, в. Кузняцы Ягор'еўскага р-на Маскоўскай вобл. — 3.1.1990), расійская і бел. актрыса. Засл. арт. Беларусі (1961). Скончыла Маск. гар. тэатр. вучылішча (1946). Працавала ў т-рах Душанбе, Брэсцкім абл. драм. З 1948 у Дзярж. рус. драм. т-ры Беларусі. У 1965—79 у Маскоўскім канцэртным аб'яднанні. Выканаўца вострахарактарных, камед. роляў. Яе творчасці ўласціва яркасць знешняга малюнка ролі, пластычная выразнасць, кідкасць сцэн. фарбаў, выкарыстанне прыёмаў гратэску, шаржу, карыкатуры. Сярод лепшых роляў у рус. драм. т-ры Беларусі: Таццяна («Мяшчане» М.Горкага), міс Пірс («Пігмаліён» Б.Шоу), Беліса («Хітрамудрая закаханая» Лопэ дэ Вэгі), Сойка («Доктар філасофіі» Б.Нушыча), Сандра Мар'янен («Каменнае гняздо» Х.Вуаліёкі), Зоя Шубейкіна («Дзікуны» С.Міхалкова), Мары-Клер («За другім фронтам» В.Сабко) і інш. Здымалася ў кіно.

А.І.Шах-Парон.

ТРЫ (Tree) Герберт Дрэйпер Бірбам (17.12.1853, Лондан — 2.7.1917), англійскі акцёр, антрэпрэнёр, рэжысёр. Сцэн. дзейнасць пачаў у 1876, з 1887 узначальваў т-р «Хеймаркет», у 1897—1915 — т-р «Хэр Маджэстыс». Паставіў 20 п'ес У.Шэкспіра. Сярод інш. спектакляў: «Танцоўшчыца» Г.Джонса (1891), «Жанчына, не вартая ўвагі» О.Уайльда (1893), «Ірад» (1900), «Уліс» (1902), «Нерон» (1906) С.Філіпса, «Уваскрэсенне» паводле Л.Талстога (1903), «Пігмаліён» Б.Шоу (1914) і інш. Пастаноўкі вылучаліся відовішчнасцю, пышнасцю, знешнімі эфектамі. Сярод роляў: Гамлет, Макбет, Рычард II (аднайм. п'есы Шэкспіра), Няхлюдаў («Уваскрэсенне»). У 1904 у Лондане заснаваў школу драм. мастацтва (пазней Каралеўская акадэмія драм. мастацтва).

ТРЫАЗІ́НЫ, шасцічленныя *гетэрацыклічныя злучэнні* з 3 атамамі азоту ў цыкле. Адрозніваюць 1,3,5-Т. (сім. Т. — бясколерныя крышталі, $t_{пл}$ 86 °С), 1,2,4-Т. (несіметрычны Т. — бледна-жоўтае масла,



а б в

Трыазіны. Структурная формула: а — 1,3,5-трыазіну; б — 1,2,4-трыазіну; в — 1,2,3-трыазіну.

$t_{пл}$ 16—17,5 °С) і 1,2,3-Т. (віцынальны Т. — бясколерныя крышталі, $t_{пл}$ 69,5—71 °С). Т. растваральніках. Утвараюць солі з к-тамі. Найб. пашыраны вытворныя 1,3,5-Т., найважн. з іх 2,4,6-вытворныя (*меламін*, цыянуравая к-та, цыянурхларыд і інш.) атрымліваюць цыклатрымерызацыяй злучэнняў, што маюць цыянагрупу —C≡N, пераважна *нітрылаў*. Выкарыстоўваюць як *гербіцыды*, фарбавальнікі для цэлюлозных валокнаў, аптычныя адбельвальнікі, інсектыцыды і інш.

ТРЫАЦЭТА́ТНАЕ ВАЛАКНО́, адзін з відаў *ацэтатнага валакна*.

ТРЫ́БА (лац. tribus ад tribuo дзялю, падзяляю), у Старажытным Рыме: 1) племя. Паводле рым. традыцыі стараж. насельніцтва Рыма складалася з трох Т. — Рамнаў (*лацінаў*), Тыцыяў (*сабінаў*) і Луцэраў (*этрускаў*). Першапачаткова кожная Т. ўключала 100, потым 300 родаў. 2) Тэрытарыяльныя і выбарчыя акругі, што мелі 1 голас у трыбутных каміцыях (сходах па Т.). Увядзенне гэтых Т. традыцыйна прыпісваюць *Сервію Тулію* (сярэдзіна 6 ст. да н.э.), які падзяліў Рым з навакольлем на 4 гар. і 17 сельскіх Т. Пасля заваёвы Рымам Італіі колькасць Т. выросла да 35.

А.Г.Зельскі.

ТРЫ́БА (ад лац. tribus племя), к а л е н а, сістэматычная (таксанамічная) катэгорыя, прамежкавая паміж падсямействам і *родам*. Выкарыстоўваецца для аб'яднання блізкіх родаў раслін, жывёл, бактэрый. Для лац. назваў Т. у наменклатуры раслін і бактэрый прыняты канчатак -eae, а ў заалогіі -ini. Вял. Т. падзяляюць на падтрыбы або падкалены.

ТРЫБА́ДЫЯ, жаночы *гомасексуалізм*, тое, што *лесбіянства*.

ТРЫБАЛО́ГІЯ (ад грэч. tribos трэнне + *...логія*), назва *трыбатэхнікі* ў Вялікабрытаніі (дзе ўзнікла ў 1960-я г.), ЗША і інш. англамоўных краінах.

ТРЫБАМЕ́ТРЫЯ (ад грэч. tribos трэнне + *...метрыя*), метады вымярэнняў сіл або каэфіцыентаў знешняга *трэння* і зносу паверхняў, якія труцца. Трыбаметрычныя вымярэнні бываюць лабараторныя, пры якіх робіцца ацэнка сіл трэння і зносаўстойлівасці матэрыялаў, і натурныя, калі ацэньваецца пэўны вузел трэння.

Пры лабараторных выпрабаваннях карыстаюцца ўзорамі, якія маюць кропкавы або лінейны кантакт ці малыя плоскія паверхні. На ўзорах вызначаюць удз. сілу трэння і ўдз. знос, інтэнсіўнасць зносу ацэньваюць адносінамі таўшчыні зношанага слоя да пройдзенага шляху. Парог знешняга трэння ацэньваюць, даводзячы дадзеную пару (узор і контрцела) да задзірання — пашкоджання паверхні трэння пры рэзкім павышэнні сілы трэння і плаўнай змене скорасці або нагрузкі. Вынікі лабараторных выпрабаванняў пераносяць на рэальныя пары трэння з улікам *падобнасці тэорыі*. У рэальных машынах сілу трэння вымяраюць па змене т-ры вузла трэння, спажытай магутнасці на халастым рэжыме работы, значэнні моманту ці сілы трэння, вугле закручвання вала. Каэф. супраціўлення перакочванню вызначаюць з дапамогай цягавых дынамометраў.

Літ.: Г а р к у н о в Д.Н. Триботехника. 2 изд. М., 1989; Д о ц е н к о В.А. Изнашивание твердых тел. М., 1990. *А.П.Ласкаўнёў.*

ТРЫБАТЭ́ХНІКА (ад грэч. tribos трэнне + *тэхніка*), т р ы б а л о г і я, т р ы б о н і к а, навукова-тэхнічная дысцыпліна, якая вывучае кантактнае ўзаемадзеянне паверхняў пры адносным руху цвёрдых цел. Уключае пытанні *трэння*, зносу і змазкі механізмаў, асаблівасцей перадачы і страт энергіі і матэрыялаў у мех. абсталяванні. У Т. атрымалі развіццё: т р ы б а х і м і я (раздзел *механахіміі*, вывучае ўзаемадзеянне кантактуючых паверхняў з хімічна актыўным асяроддзем, карозію пры трэнні, уздзеянне на паверхню хімічна актыўных рэчываў, што вылучаюцца пры трэнні); т р ы б а ф і з і к а (фіз. аспекты ўзаемадзеяння кантактуючых паверхняў пры іх узаемным перамяшчэнні); т р ы б а м е х а н і к а (механіка ўзаемадзеяння кантактуючых паверхняў пры трэнні, рассеянне энергіі, імпульсу, рэлаксацыйныя ваганні, рэверсіўнае трэнне, дастасоўнасць ураўненняў гідрадынамікі да задач трэння, зношвання і змазвання).

Працэсы трэння пачалі вывучаць *Г.Галілей* і *І.Ньютан*, якія адкрылі асн. законы механікі. Франц. вучоныя Г.Амантон (1699) і Ш.А.Кулон (1785) вызначылі асобныя законы трэння цвёрдых цел на аснове эксперыментаў, пацвердзіўшы раней адкрытыя Леанарда да Вінчы залежнасці. Кулон прапанаваў прыладу для вымярэння трэння — трыбометр. У 1734 англ. вучоны І.Дэзагюлье абгрунтаваў гіпотэзу пра ўплыў на трэнне сіл малекулярнага счаплення. Рас. вучоны М.П.Пятроў у 1883 выканаў даследаванні па руху змазаных дэталей машын (радыяльных падшыпнікаў). У 1920 англ. вучоныя У.Хардзі і Дж.Томлінсан распрацавалі «адгезійную» тэорыю трэння; у 1936 Ф.Боўдэн і К.Рыдлер выявілі нераўнамернасць размеркавання цеплавой энергіі ў датычных паверхнях трэння; у 1940-я г. Боўдэн, Дж.Тэйбар і інш. даказалі, што трэнне мае дваістую (малекулярна-мех.) прыроду, уключае адгезійныя і дэфармацыйныя працэсы; у 1957 Д.Баруэл склаў класіфікацыю асн. фіз. механізмаў зношвання: адгезійны, абразіўны, каразійны, паверхневастомленасны знос. Значны ўклад у Т. зрабілі рас. і сав. вучоныя М.Я.Жукоўскі, Я.А.Чудакоў, П.А.Рэбіндэр, Б.У.Дзярагін, Дз.М.Гаркуноў і інш.

На Беларусі даследаванні па Т. вядуцца з 1960-х г. у Ін-це механікі металапалімерных сістэм і Фізіка-тэхн. ін-це Нац. АН Беларусі, БДУ, гомельскім НВА «Трыбафатыка» і інш. (У.А.*Белы*, А.І.*Свірыдзёнак*, Ю.М.*Плескачэўскі*, М.І.*Петракавец*, В.Г.*Саўкін*, А.У.*Белы*, Л.А.*Сасноўскі*, П.М.Багдановіч, В.Я.Прушак і інш.).

Літ.: Г а р к у н о в Д.Н. Триботехника. 2 изд. М., 1989; К о с т е ц к и й Б.И. Трение, смазка и износ в машинах. Киев, 1970; И к р а м о в У.А., Л е в и т и н М.А. Основы триботехники. Ташкент, 1984; Акустические и электрические методы в триботехнике. Мн., 1987; Г о р я ч е в а И.Г., Д о б ы ч и н М.Н. Контактные задачи в трибологии. М., 1988; Ч и х о с Х. Системный анализ в трибонике: Пер. с англ. М., 1982; Трибология: Исслед. и приложения: Опыт США и стран СНГ. М., 1993; Б о г д а н о в и ч П.Н., П р у ш а к В.Я. Трение и износ в машинах. Мн., 1999.

А.П.Ласкаўнёў.

ТРЫБАФА́ТЫКА (ад грэч. tribos трэнне + англ. fatigue стомленасць), навуковатэхн. дысцыпліна, якая вывучае зносастомленасныя пашкоджанні (ЗСП) і разбурэнні сілавых сістэм. Грунтуецца на механіцы стомленаснага разбурэння, *трыбатэхніцы*, тэорыі надзейнасці мех. сістэм, матэрыялазнаўстве і інш. Выкарыстоўваецца для кіравання працэсамі ЗСП з мэтай забеспячэння аптымальнага рэсурсу сілавой сістэмы.

У Т. сілавой называюць усякую сістэму, якая ўспрымае і перадае паўторна-пераменную нагрузку і ў якой адначасова рэалізуецца працэс *трэння* ў любым праяўленні (слізганні, качэнні, удары і інш.). Пры эксплуатацыі гэтых сістэм узнікаюць комплексныя ЗСП, асн. відамі якіх з'яўляюцца фрыкцыйна-мех., кантактна-мех., эразійна- і каразійна-мех. і фетынг-стомленасць. Паводле Т., зменьваючы ўмовы трэння і (або) умовы цыклічнага нагружэння належным чынам, можна эфектыўна кіраваць кінетыкай працэсаў ЗСП. Стан сілавой сістэмы ў любы момант эксплуатацыі ацэньваецца па інтэгральным параметры, на якім заснавана кіраванне гэтымі працэсамі. У Т. робяць разлік работаздольнасці сілавых сістэм па крытэрыях ЗСП. Для ацэнкі нясучай здольнасці, надзейнасці і даўгавечнасці аб'ектаў выкарыстоўваюць статыстычную мадэль дэфармаванага цвёрдага цела з небяспечным аб'ёмам — канечнай вобласцю з крытычным напружаннем у ёй.

На Беларусі даследаванні па Т. вядуцца ў НВА «Трыбафатыка» і Бел. дзярж. ун-це транспарту (Гомель), Ін-це механікі машын Нац. АН Беларусі, ВА «Гомсельмаш» (Л.А.Сасноўскі, М.С.Высоцкі, А.У.Багдановіч, У.А.Шурынаў, Г.П.Ажыгар, В.А.Жмайлік, А.М.Елавой і інш.). Значны ўклад у станаўленне і развіццё Т. зрабілі таксама расійскія (К.В.Фралоў, М.А.Махутаў), украінскія (В.Т.Трошчанка) і інш. вучоныя.

Літ.: С о с н о в с к и й Л.А., М а х у т о в Н.А. Трибофатика: износоусталостные повреждения в проблемах ресурса и безопасности машин. М.; Гомель, 2000; Слово о трибофатике. Мн., 1996; Износоусталостные повреждения и их прогнозирование (трибофатика). Гомель, 2001. *Л.А.Сасноўскі.*

ТРЫБАЭЛЕКТРЫ́ЧНАСЦЬ (ад грэч. tribos трэнне + *электрычнасць*), узнікненне электрычных зарадаў пры трэнні 2 разнародных цел.

У аснове Т. ляжаць *кантактныя з'явы*. Пры *трэнні* цвёрдых цел адбываецца пераразмеркаванне эл. зарадаў. Кантактная электрызацыя 2 металаў ці паўправаднікоў, металу і паўправадніка абумоўлена пераходам электронаў пры кантакце 2 цел ад рэчыва з меншай да рэчыва з большай *работай выхаду*. Электрызуюцца абодва целы, якія ўдзельнічаюць у трэнні; яны атрымліваюць аднолькавыя па абс. значэнні і процілеглыя па знаку эл. зарады, прычым, як правіла, дадатна электрызуецца цела з большай *дыэлектрычнай пранікальнасцю*. Пры трэнні металу з дыэлектрыкам Т. абумоўлена пераходам электронаў з металу ў дыэлектрык, пры трэнні 2 дыэлектрыкаў — дыфузіяй электронаў і іонаў. Т. вадкасцей звязана з узнікненнем падвойных эл. слаёў на паверхні раздзелу 2 вадкіх асяроддзяў з рознай дыэл. пранікальнасцю. Т. узнікае пры многіх вытв. працэсах (напр., пры прадзенні, распырскванні вадкасцей) і прыводзіць да непажаданага назапашвання статычных эл. зарадаў, ліквідаваць якія можна зазямленнем метал. дэталей або з дапамогай разраднікаў, іанізацыяй паветра і інш. мерамі.

ТРЫБО́НІКА (ад грэч. tribos трэнне), назва *трыбатэхнікі*, пашыраная ў Францыі і інш. еўрапейскіх краінах.

ТРЫБУ́НА (франц. tribune), 1) узвышэнне для выступлення прамоўцы. 2) Збудаванне на плошчы (у час парада, дэманстрацыі), стадыёне з паступовым узвышэннем радоў з месцамі для публікі. Т. наз. таксама месца, сфера ажыццяўлення чыёй-н. грамадскай дзейнасці.

«ТРЫБУ́НА МАСТА́ЦТВА», бел. тэатральна-маст. ілюстраваны часопіс. Выдаваўся ў лют.—чэрв. 1925 у Мінску Цэнтр. праўленнем саюза работнікаў мастацтва Беларусі (з № 8 разам з Белдзяржкіно). Матэрыялы друкаваліся на бел. і рус. мовах. У праграму выдання ўваходзіла грамадскае абмеркаванне праблем маст. творчасці, пошуку жывой сувязі мастацтва і літ.-маст. крытыкі з нар. масамі, распрацоўка эстэт. прынцыпаў бел. мастацтва, выяўленне ў ім нац. стылю, развіццё маст. самадзейнасці. Рэдакцыя давала магчымасць выказаць свае погляды прадстаўнікам розных кірункаў у мастацтве з умовай, каб пытанні маст. творчасці разглядаліся «ў сувязі з агульнымі задачамі рабочага класа». У рэцэнзіях, аналітычна-праблемных і дыскусійных артыкулах часопіс змагаўся за высокі ідэйна-маст. ўзровень творчасці тэатр. і муз. калектываў, кінематографа, дзеячаў выяўл. і прыкладнога мастацтва. Выступаў за ўсебаковае развіццё бел. культуры. Імкнуўся пераадолець правінцыялізм у поглядах на бел. мастацтва толькі як на этнаграфічнае, засн. на стылізацыі фальклору тэм, вобразаў і матываў. Аўтары асобных артыкулаў прапаноўвалі авангардысцкую і пралеткультаўскую праграму сацыяліст. мастацтва. Часопіс знаёміў з бел. л-рай, адзначыў юбілеі А.Гурло, Е.Міровіча, змяшчаў партрэты пісьменнікаў і дзеячаў мастацтва. Друкаваў рэпертуар тэатраў і кіно Мінска і Віцебска. Інфармаваў пра асн. маст. падзеі ў рэспубліках і за мяжой. У часопісе супрацоўнічалі Я.Барычэўскі, С.Вальфсон, Ю.Дрэйзін, Я.Дыла, З.Жылуновіч, М.Каспяровіч, Міровіч, М.Шчакаціхін і інш. Выйшла 14 нумараў. *У.М.Конан.*

ТРЫБУНА́Л (ад лац. tribunal судзілішча), 1) судовая ўстанова ў ВКЛ. Гл. *Трыбунал Вялікага княства Літоўскага, Трыбунал скарбовы.* 2) У Францыі ў перыяд рэвалюцыі канца 18 ст. выключны суд па справах палітычных злачынстваў. 3) У першыя гады савецкай улады спец. суд — *рэвалюцыйны трыбунал.* 4) У б. СССР і сучаснай Расіі — суды для ажыццяўлення правасуддзя ва ўзбр. сілах. Гл. таксама *Міжнародны ваенны трыбунал.*

ТРЫБУНА́Л ВЯЛІ́КАГА КНЯ́СТВА ЛІТО́ЎСКАГА, Галоўны Літоўскі Трыбунал, вышэйшы апеляцыйны суд дзяржавы, пастановы якога мелі сілу пастаноў *сойма*. Створаны ў 1581, дзейнічаў з 1582. Складаўся з 46 суддзяў-дэпутатаў, якіх выбіралі на павятовых *соймiках* па 2 ад кожнага павета тэрмінам на 1 год (з 1588 яшчэ выбіраліся 3 дэпутаты ад Жамойцкай зямлі). Разглядаў апеляцыі на рашэнні земскіх, замкавых і падкаморскіх судоў, а таксама скаргі на рашэнні павятовай адміністрацыі. Суддзямі маглі быць выключна шляхціцы, ураджэнцы ВКЛ, якія мелі ўласныя маёнткі і былі дасведчанымі ў праве і мясц. звычаях. Сесіі трыбунала праходзілі пад старшынствам выбранага ім *маршалка*, пастановы прымаліся на аснове Статута ВКЛ, сеймавых канстытуцый і звычаёвага права большасцю галасоў. Месцам сесій трыбунала была Вільня (штогод), Мінск і Навагрудак (па чарзе праз год); да 1588 сесіі праходзілі і ў Троках. Па 1-й інстанцыі трыбуналу былі падсудныя ўсе справы, аднесеныя да яго кампетэнцыі, а таксама справы аб неналежным выкананні старостамі і замкавымі ўраднікамі сваіх абавязкаў пры судаводстве і справы духоўных асоб (пры разглядзе апошніх бралі ўдзел дэпутаты ад духавенства). Парадак судаводства ў трыбунале рэгламентаваўся законам, яго рашэнні выконваліся павятовымі судамі. Акрамя разгляду спраў трыбунал ажыццяўляў натарыяльныя дзеянні: замацоўваў тастаменты (завяшчанні), сведчыў дагаворы куплі-продажу маёнткаў, пазыкі і інш.

Літ.: Статут Вялікага княства Літоўскага 1588: Тэксты. Давед. Камент. Мн., 1989.

Г.А.Маслыка.

ТРЫБУНА́Л СКАРБО́ВЫ, адм. і судовая ўстанова ў ВКЛ, якая кантралявала даходы і выдаткі дзярж. скарбу, разглядала справы аб нявыплаце падаткаў дзяржаве. Бярэ пачатак ад утворанай на сойме 1591 скарбовай камісіі ВКЛ, у склад якой увайшоў вял. падскарбі, 4 сенатары і прадстаўнікі ад кожнага ваяводства. Пераемніцай камісіі стала створаная ў 1598 дэпутацыя сенатараў і соймавых паслоў, якая павінна была рэвізаваць скарб ВКЛ пачынаючы з 1591. Сойм 1613 у Вільні стварыў з тымі ж функцыямі Т.с., якому было даручана сабраць даўгі ў скарб ВКЛ з правам судзіць даўжнікоў па справах з 1609. У склад Т.с. ўвайшлі падскарбі, 6 сенатараў і прадстаўнікі ад ваяводстваў. У часы праўлення Жыгімонта III Т.с. склікаўся ў 1613, 1621, 1626, 1629 (двойчы) і 1631, у часы Уладзіслава IV — у 1633, 1635 і 1647. Засядаў Т.с. ў Вільні, у яго рабоце прымалі ўдзел і прадстаўнікі войска. Т.с. разглядаў суд. справы, што датычылі войска, скаргі цывільных на вайскоўцаў і наадварот, ажыццяўляў канфіскацыю тавараў і інш. Войска давала справаздачу па сваіх грашовых даходах і выдатках. У 1726 пастановай Гродзенскага сойма частка функцый Т.с. перададзена *Трыбуналу Вялікага княства Літоўскага.* Т.с. скасаваны ў 1764 з утварэннем Камісіі скарбовай ВКЛ.

Літ.: Filipczak-Kocur A. Skarb litewski za pierwszych dwu Wazów, 1587—1648. Wrocław, 1994.

ТРЫБУ́НЫ ВАЕ́ННЫЯ (лац. tribuni militum), у Старажытным Рыме камандныя пасады ў арміі (камандзіры атрадаў у *легіёнах* і саміх легіёнаў). У кожным легіёне было па 6 Т.в.: 1 з сенатараў, 5 з коннікаў. Паміж 444 і 367 да н.э. для *плебеяў* была ўведзена пасада Т.в. з консульскай уладай з мэтай не дапусціць плебеяў да кансулату. Пасля 367 да н.э., калі адзін з *консулаў* стаў выбірацца з ліку плебеяў, Т.в. скасаваны. *А.Г.Зельскі.*

ТРЫБУ́НЫ НАРО́ДНЫЯ, трыбуны плебейскія (лац. tribuni plebis), у Старажытным Рыме вышэйшыя выбарныя (з 494 да н.э.) службовыя асобы з *плебеяў*. Валодалі правам умяшання ў дзеянні патрыцыянскіх магістратаў (акрамя *дыктатара*) і *сената*; маглі забараніць іх пастановы (права veto). Т.н. складалі калегію з 2—10 асоб, якіх выбіралі на плебейскіх сходах на 1 год. Асоба Т.н. лічылася свяшчэннай і недатыкальнай. Т.н. выступалі ініцыятарамі агр. законаў і дэмакр. пераўтварэнняў. З дзейнасцю трыбунаў Тыберыя і Гая *Гракхаў*, напр., звязаны найвыш. ўздым дэмакр. руху ў Рыме. У эпоху імперыі Т.н. фармальна захаваліся, але страцілі рэальнае значэнне, паколькі носьбітамі трыбунскай улады з часоў *Цэзара* сталі імператары. *А.Г.Зельскі.*

ТРЫВА́ЛАСЦЬ матэрыялаў, уласцівасць цвёрдых цел (матэрыялаў) супраціўляцца *разбурэнню* або неабарачальнай змене формы (*пластычнай дэфармацыі*) пад дзеяннем знешніх нагрузак. Абумоўлена сіламі ўзаемадзеяння паміж атамамі або іонамі, якія складаюць цела. У сістэме СІ вымяраецца ў Н · м/кг.

У залежнасці ад матэрыялу, віду напружанага стану (расцяжэнне, сціскание, выгін і інш.), умоў эксплуатацыі (т-ра, магн., эл. і інш. палі, нераўнамернае высыханне ці набраканне, нераўнамернае працяканне фіз.-хім. працэсаў у розных частках цела і інш.) прыняты розныя меры (крытэрыі) Т.: межы прапарцыянальнасці, цякучасці, паўзучасці, трываласці і інш. Адрозніваюць Т.: тэарэтычную, якую вылічваюць праз сілы міжатамнага счаплення (роўная прыкладна $^1/_6$ модуля падоўжнай пругкасці; гл. *Модулі пругкасці*); тэхнічную — Т. рэальных матэрыялаў (меншая за 0,1 тэарэтычнай); канструкцыйную — Т. элементаў канструкцый, якая з-за шчылін, надрэзаў, драпін і інш. паверхневых дэфектаў, унутр. напружанняў, цяжкіх рэжымаў работы ніжэйшая за тэарэтычную; дынамічную, якая вызначае здольнасць матэрыялаў супрымаць без разбурэння дынамічныя нагрузкі; працяглую, калі разбурэнне матэрыялу адбываецца праз пэўны час пасля прыкладання нагрузкі (разбурэнню папярэднічае відавочная дэфармацыя матэрыялу). Удзельная Т. нітак, дроту, валокнаў і падобных матэрыялаў — велічыня, роўная адносінам разрыўнога намагання, прыкладзенага да матэрыялу, да яго лінейнай шчыльнасці. Імавернасць існавання ва ўзоры дэфекту тым большая, чым у тых жа ўзораў большых памераў (т.зв. маштабны эфект). Участкі з павышаным напружаннем, дзе найлягчэй з'яўляюцца мікрашчыліны, знаходзяцца каля паверхні (выступы, драпіны), таму паліроўка паверхні і ахоўныя пакрыцці павышаюць Т. У агрэсіўных асяроддзях Т. памяншаецца.

Літ.: Клюшников В.Д. Физико-математические основы прочности и пластичности. М., 1994; Прочность и акустическая эмиссия материалов и элементов конструкций. Киев, 1991; Прочность, устойчивость и колебания термонапряженных оболочечных конструкций. М., 1990. *А.П.Ласкаўнёў.*

ТРЫВА́ННЕ ДЗЕЯСЛО́ВА, лексіка-граматычная катэгорыя, якая паказвае на завершанасць або незавершанасць дзеяння.

У бел. і інш. слав. мовах вылучаюць 2 віды Т.дз.: незакончанае, якое выражае працягласць, паўтаральнасць дзеяння без указання на яго вынік або мяжу («жыву, жыў, буду жыць») і закончанае, якое абазначае абмежаванасць дзеяння ў часе — пачатак або канец, завершанасць дзеяння, адзін з момантаў яго працякання («пражыў, пражыву»). Дзеясловы незакончанага і закончанага трываннямў з аднолькавым лексічным значэннем утвараюць пары («вучыць — вывучыць», «жаць — зжаць»). Утварэнне трывальнай пары можа ісці двума шляхамі: перфектывацыяй (ад дзеяслова незакончанага трывання ўтвараецца дзеяслоў закончанага трывання) або імперфектывацыяй (ад дзеяслова закончанага трывання ўтвараецца дзеяслоў незакончанага трывання). Трывальныя пары дзеясловаў утвараюцца пераважна з дапамогай прыставак («вячэраць — павячэраць») і суфіксаў («натхніць — натхняць»), чаргавання гукаў у словах («збіраць — сабраць», змены месца націску («накідаць — накідаць»), суплетывізму асноў («гаварыць — сказаць»). Большасць дзеясловаў бел. мовы парныя паводле трывання («рабіць — зрабіць», «спазняцца — спазніцца»). Ёсць дзеясловы, што маюць форму толькі аднаго трывання — незакончанага («залежаць», «паважаць») або закончанага («абнародаваць», «схамянуцца»). Такія дзеясловы не ўтвараюць трывальныя пары і называюцца няпарнымі або аднатрывальнымі. У некат. дзеясловах значэнне закончанага і незакончанага Т.дз. супадае ў адной форме («атакаваць», «сігналізаваць»). Такія дзеясловы лічацца двухтрывальнымі. З катэгорыяй трывання цесна звязана катэгорыя *часу дзеяслова*.

Літ.: Сучасная беларуская літаратурная мова: Марфалогія. 2 выд. Мн., 1980; Беларуская граматыка. Ч. 1. Мн., 1985; Шуба П.П. Сучасная беларуская мова: Марфаналогія. Марфалогія. Мн., 1987; Сучасная беларуская літаратурная мова: Марфалогія. Мн., 1997. *Т.П.Бандарэнка.*

ТРЫВІЯ́ЛЬНАЯ ЛІТАРАТУ́РА, гл. *Масавая літаратура*.

ТРЫГАНАМЕТРЫ́ЧНАЕ НІВЕЛІ́РАВАННЕ, геадэзічнае нівеліраванне, метад вызначэння рознасці вышынь (перавышэнняў) пунктаў на зямной паверхні. Пры Т.н. вымяраюць вуглы нахілу ν і даўжыні нахіленай лініі візіравання *S* або яе праекцыі *s* на гарызантальную плоскасць.

Перавышэнне *h* вылічваюць паводле формулы: $h = s \cdot \mathrm{tg}\nu + (1\text{-}k)\, s^2/2R$, дзе *k* — каэфіцыент рэфракцыі, *R* — радыус Зямлі як шара. На кароткія адлегласці выкарыстоўваецца формула: $h = s \cdot \mathrm{tg}\nu + i\text{-}v$, дзе *i* — вышыня прылады, *v* — вышыня візіравання. Для вымярэння вуглоў выкарыстоўваюць геад. прылады: *кіпрэгель, тахеометр, тэадаліт*; адлегласцей — рулеткі, аптычныя дальнамеры і інш. Т.н. выкарыстоўваецца пры топагеадэзічных работах на мясцовасці і маркшэйдэрскіх здымках у горных выпрацоўках, нахілы якіх большыя за 8°. *Р.А.Жмойдзяк.*

ТРЫГАНАМЕТРЫ́ЧНАЕ ЎРАЎНЕ́ННЕ, алгебраічнае *ўраўненне* адносна *трыганаметрычных функцый* ад невядомага аргумента. Для рашэння Т.ў. на аснове суадносін паміж трыганаметрычнымі функцыямі яго зводзяць да ўраўнення адносна адной з іх. Пасля чаго карані Т.ў. атрымліваюць з дапамогай *адваротных трыганаметрычных функцый*.

ТРЫГАНАМЕТРЫ́ЧНЫ ПУНКТ, трыянгуляцыйны пункт, геадэзічны пункт, каардынаты якога атрыманы метадам *трыянгуляцыі*. Дакладнае яго становішча на мясцовасці замацоўваецца ў зямлі бетоннай або метал. пірамідай і над зямлёй маяком або вышкай; наносіцца на тапаграфічныя карты. Гл. таксама *Геадэзічны пункт, Геадэзічныя знакі, Сігнал геадэзічны*.



Трыганаметрычнае нівеліраванне: *i* — вышыня прылады; *V* — вышыня візіравання; *n* — рознасць вышынь (перавышэнне) паміж пунктамі *A* і *B*; *S* — лінія візіравання; *s* — гарызантальная праекцыя лініі візіравання; ν — вугал нахілу візірнага праменя.

ТРЫГАНАМЕТРЫ́ЧНЫ ШЭ́РАГ, функцыянальны *шэраг* па сінусах і косінусах кратных дуг. Уведзены *Л.Эйлерам* (1744). У матэм. запісе маюць выгляд:

$$a_0/2 + \sum_{k=1}^{\infty} (a_k \cos kx = b_k \sin kx)$$

або ў камплекснай форме $\sum_{k=-\infty}^{\infty} c_k e^{ikx}$, дзе a_k, b_k і c_k — каэфіцыенты Т.ш. Асобная форма Т.ш. — *Фур'е шэраг*. Выкарыстоўваецца ў матэм. аналізе, тэорыі лікаў і інш.

ТРЫГАНАМЕТРЫ́ЧНЫЯ ФУ́НКЦЫІ, клас *элементарных функцый*, да якога адносяць функцыі сінуса (sin), косінуса (cos), тангенса (tg), катангенса (ctg), секанса (sec) і касеканса (cosec). Графікі Т.ф. перыядычныя, прычым графікі tg і ctg маюць перыяд π, астатнія — 2π.

Узніклі ў сувязі з даследаваннямі ў астраноміі і геаметрыі. Суадносіны паміж адрэзкамі трохвугольніка і акружнасці сустракаюцца ў 3 ст. да н.э. ў працах *Эўкліда, Архімеда*, Апалонія Пергскага і інш. матэматыкаў Стараж. Грэцыі. Т.ф. разглядаліся як адрэзкі і ў такой форме выкарыстоўваліся *Арыстархам, Гіпархам, Пталамеем* і Менелаем (1 ст. да н.э.) пры рашэнні сферычных трохвугольнікаў (гл. *Сферычная трыганаметрыя*). Раскладанне Т.ф. у ступенныя шэрагі атрымаў І.*Ньютан* (1669). Сучасную форму тэорыі Т.ф. надаў Л.*Эйлер*. Яму належаць таксама вызначэнне Т.ф. для сапраўдных і камплексных аргументаў, сімволіка, сувязі з паказнікавай функцыяй (гл. *Эйлера формулы*), *артаганальнасць* сістэмы сінусаў і косінусаў, формулы раскладання сінуса і косінуса ў бясконцыя здабыткі, катангенса — на элементарныя дробы. Т.ф. сапраўднага аргумента разглядаюць з дапамогай акружнасці адзінкавага радыуса (трыганаметрычнага круга), зададзенай на каардынатнай плоскасці. Вугал вымяраецца ў градусах або радыянах (радзей градах), можа змяняцца ў межах ад $-\infty$ да $+\infty$ і лічыцца дадатным, калі ён адлічаны супраць ходу гадзіннікавай стрэлкі. Для вострых вуглоў Т.ф. вызначаюцца таксама праз суадносіны паміж старанамі прамавугольнага трохвугольніка. Суадносіны паміж Т.ф. вызначаюцца формуламі:

$$\mathrm{tg}\, x = \frac{\sin x}{\cos x}, \quad \mathrm{ctg}\, x = \frac{\cos x}{\sin x},$$

$$\mathrm{cosec}\, x = \frac{1}{\sin x}, \quad \sec x = \frac{1}{\cos x};$$

паміж Т.ф. і *гіпербалічнымі функцыямі* ад уяўнага аргумента — формуламі: $\sin z = -i\, sh\, iz$, $\cos z = -i\, ch\, iz$, $\mathrm{tg}\, z = -i\, th\, iz$. Т.ф. камплекснага аргумента



Сувязь **трыганаметрычных функцый** вострага вугла: 1 — са старанамі прамавугольнага трохвугольніка ($\sin\alpha = a/c$, $\cos\alpha = b/c$, $\mathrm{tg}\alpha = a/b$, $\mathrm{ctg}\alpha = b/a$, $\sec\alpha = c/b$, $\mathrm{cosec}\alpha = c/a$); 2 — з адрэзкамі, звязанымі з акружнасцю адзінкавага радыуса ($\sin\alpha = AB$, $\cos\alpha = OB$, $\mathrm{tg}\alpha = CD$, $\mathrm{ctg}\alpha = EF$, $\sec\alpha = OC$, $\mathrm{cosec}\alpha = OF$, I—IV — чвэрці).

$z = x + iy$, дзе x і y — сапраўдныя лікі, можна выразіць праз трыганаметрычныя і гіпербалічныя функцыі, напр., $\sin(x + iy) = \sin x \operatorname{ch} y + i\cos x \operatorname{sh} y$. Існуюць таксама формулы, якія даюць магчымасць знайсці выразы Т.ф. вял. аргументаў, палавінных, падвойных і кратных (гл. *Муаўра формула*) значэнняў аргумента, выразіць здабытак Т.ф. праз іх суму і інш. Вытворныя Т.ф. выражаюцца праз Т.ф., напр., $(\sin x)' = \cos x$, $(\cos x)' = -\sin x$; першаісныя — праз Т.ф. ці іх лагарыфмы, напр., для $\sin x$ і $\operatorname{tg} x$ першаісныя адпаведна $-\cos x$ і $\ln|\sec x|$. Раскладанне Т.ф. ў ступенныя шэрагі выкарыстоўваецца пры набліжаным вылічэнні іх значэнняў, напр., з дакладнасцю да 0,0003 $\cos x = 1 - \frac{x^2}{2!} + \frac{x^4}{4!}$ пры $0 < x < \pi/4$, а таксама пры вызначэнні Т.ф. ад камплексных пераменных. Т.ф. выкарыстоўваюцца ў розных галінах навукі і тэхнікі, напр., для апісання перыядычных (у т.л. вагальных) працэсаў.

А.А.Гусак.

ТРЫГАНАМЕ́ТРЫЯ (ад грэч. trigōnon трохвугольнік + *...метрыя*), раздзел матэматыкі, які вывучае *трыганаметрычныя функцыі* і іх дастасаванні да геаметрыі. Элементы Т. сустракаюцца ў *Эўкліда* (3 ст. да н.э.); значнае развіццё атрымала ў працах арабскіх і індыйскіх матэматыкаў (9—13 ст.). Сучасны выгляд набыла ў працах Л.*Эйлера* (18 ст.).

Падзяляецца на плоскую і *сферычную трыганаметрыю*. Калі a, b, c — стораны трохвугольніка, A, B, C — процілеглыя вугламі і ўсе стораны і вуглы раўнапраўныя, то асн. формулы плоскай Т. маюць выгляд: $\frac{a}{\sin A} = \frac{b}{\sin B} = \frac{c}{\sin C}$ (тэарэма сінусаў), $a^2 = b^2 + c^2 - 2bc \cdot \cos A$ (тэарэма косінусаў), $\frac{a-b}{a+b} = \frac{\operatorname{tg}\frac{A-B}{2}}{\operatorname{tg}\frac{A+B}{2}}$ (тэарэма тангенсаў). Плошчу трохвугольніка вылічваюць паводле формул:

$$S = \frac{1}{2} ab \sin C = \frac{a^2}{2} \cdot \frac{\sin B \cdot \sin C}{\sin(B+C)} =$$

$$= p^2 \cdot \operatorname{tg}\frac{A}{2} \cdot \operatorname{tg}\frac{B}{2} \cdot \operatorname{tg}\frac{C}{2},$$

дзе p — паўперыметр трохвугольніка.

А.А.Гусак.

ТРЫГАТРО́Н [ад *трыгер* + (*элек*)*трон*], высакавольтная іонная (газаразрадная) прылада; трохэлектродны кіравальны *разраднік*. Мае анод, халодны катод і дапаможны (падпальны) электрод. Бывае адкрыты (разрад адбываецца ў паветры) і герметызаваны (электроды размешчаны ў шкляной ці керамічнай абалонцы, запоўненай інертным газам). Выкарыстоўваецца ў асн. для фарміравання эл. імпульсаў для *мадуляцыі* высокачастотных ваганняў у магутных генератарных лямпах і магнетронах.

ТРЫ́ГЕР (англ. trigger), спускавая схема з 2 (радзей больш) станамі ўстойлівай раўнавагі; адзін з асн. элементаў *лічыльнікаў, вылічальных машын*, фарміравальнікаў імпульсаў і інш. Стан раўнавагі Т. захоўваецца.

Мае 2 выхады — асноўны (прамы) і інверсны. Асн. параметры: хуткадзеянне (найб. лік пераключэнняў за адзінку часу), час спрацоўвання (час пераходу з аднаго стану ў другі), узроўні ўваходных і выхадных сігналаў. Пераход Т. з аднаго стану ў другі (перакульванне) адбываецца пры падачы кіроўных сігналаў на розныя ўваходы (установачны запуск) ці паслядоўна на адзін і той жа (лічыльны запуск). Найб. пашыраны электронныя Т. на аснове электравакуумных, газаразрадных і паўправадніковых прылад, інтэгральных схем. Выкарыстоўваюцца як адны з найб. універсальных элементаў лагічных і выліч. прылад.

ТРЫ́ГЛАЎ (Triglav), горны масіў і аднайм. вяршыня ў Юлійскіх Альпах, у Славеніі (2863 м). Складзены з вапнякоў. Ледавіковыя і карставыя формы рэльефу. Горныя лясы, лугі, азёры, вадаспады. Нац. парк Трыглаў.

ТРЫГЛІ́Ф (грэч. triglóphōs ад tri- у складаных словах — тры + glyphō рэжу) у архітэктуры, прамавугольная, крыху выцягнутая па вертыкалі пліта з некалькімі жалабкамі. Звычайна Т. размяшчаюцца па восях калон і *інтэркалумніяў*, на канцах фрыза па вуглах будынка; у выніку чаргавання з *метопамі* ўтвараюць фрыз у *дарычным ордэры*. Т. ў камені ўяўляюць сабой арнаментаваныя тарцы бэлек першапачатковага драўлянага перакрыцця. Вядомы ў драўлянай архітэктуры Стараж. Грэцыі. У бел. архітэктуры Т. найб. характэрны для збудаванняў стыляў класіцызму і ампіру (*Гомельскі Петрапаўлаўскі сабор*). У некат. будынках Т. пад уплывам мясц. нар. традыцый адрозніваўся ад класічнай першаасновы і набываў своеасаблівую трактоўку (*Пінскі палац*). Матывы дарычных фрызаў з Т. выкарыстаны ў архітэктуры 1950-х г. (порцікі-лоджыі паміж дамамі на пл. Перамогі ў Мінску).



Трыгліф.



Графікі **трыганаметрычных функцый**: 1 — $y = \sin x$; 2 — $y = \cos x$; 3 — $y = \operatorname{tg} x$; 4 — $y = \operatorname{ctg} x$; 5 — $y = \sec x$; 6 — $y = \operatorname{cosec} x$.

ТРЫГУ́БІЦА, бел. традыцыйная рыбалоўная прылада. Лакальныя назвы трохсценка, абарэц; у Паазер'і — рэжоўка, гант; на Палессі — баўтуха, свіроўка, гонка, дрыгавіца, крыжоўка. На Беларусі вядома здаўна. Звесткі пра яе змяшчаюць пісьмовыя крыніцы з 16 ст. (напр., «Устава на валокі» 1557). Складаецца з 3 сеткавых палотнішчаў: аднаго густога паміж двума рэдкімі, з вялікімі вочкамі (рэдзі). Рыба, натрапіўшы на сеткавую сцяну, праходзіць праз вочка 1-й рэдзі, «набірае» на сябе густое сеткавае палатно і, прайшоўшы праз вочка 2-й рэдзі, утварае мяшок-пастку. Рыбачылі Т. пераважна ў загон (з адной ці дзвюх лодак), рыбу ў сетку заганялі баўтом. Часам Т. выкарыстоўвалі як стаўную — перагароджвалі рэчкі і пратокі. Была пашырана да пач. 20 ст. У наш час лоўля рыбы Т. дазволена толькі ў прамысл. рыбалоўстве.

І.М.Браім.

ТРЫГУБО́ВІЧ Віктар Іванавіч (30.11.1935—1995), расійскі кінарэжысёр. Засл. дз. маст. Расіі (1976). Скончыў Усесаюзны дзярж. ін-т кінематаграфіі (1963). Творчасць вызначаецца публіцыстычнай накіраванасцю, увагай да розных аспектаў грамадскіх працэсаў. Зняў маст. філь-

мы: «Спякотны ліпень» (1965), «На вайне як на вайне» (1969), «Старыя сцены» (1974), «Давер» (з Э.Лайне, 1977), «Адваротная сувязь» (1978), «Сыходзячы — сыходзь» (1980), «Тройчы пра каханне» (1981), «Прахіндзіяда, або Бег на месцы» (1985), «Хмель» (1991) і інш.

ТРЫДА́КНЫ (Tridacna), род малюскаў сям. трыдакнід кл. двухстворкавых. 5 відаў. Пашыраны ў цёплых морах Інд. і Ціхага акіянаў. Жывуць на мелкаводдзях сярод каралавых рыфаў. Найб. вядомая Т. гіганцкая (T. gigas).

Даўж. Т. гіганцкай да 1,4 м, маса з ракавінай да 250 кг, маса цела каля 30 кг. Ракавіна з радыяльнымі хвалістымі рэбрамі і лопасцямі, без перламутравага слоя. Гал. корм — сімбіятычныя аднаклетачныя водарасці зааксантэлы, якія жывуць у мантыі. Фільтратары. Гермафрадыты. Аб'екты промыслу, мяса выкарыстоўваецца ў ежу, ракавіна — як будаўнічы матэрыял, на ўпрыгожанні, побытавыя вырабы.



Трыдакна гіганцкая.

ТРЫЕНА́ЛЕ, міжнародная выстаўка, што адбываецца раз у 3 гады. Напр., Т. графікі ў г. Таяма (Японія), у г. Кракаў (Польшча).

ТРЫ́ЕР (ад франц. trier адбіраць, сартаваць), машына для ачысткі насення асн. культуры ад дамешкаў і сартавання па даўжыні ачышчанага насення. Бывае часткай (рабочым органам) *зернеачышчальных машын*. Найб. пашыраны цыліндрычныя і дыскавыя Т.

Рабочы орган цыліндрычных Т. — ячэйкавыя цыліндры. У цыліндрах з дробнымі ячэйкамі (кукольных) адбіраюцца кароткія зярняты і дамешкі, у цыліндрах з ячэйкамі большага дыяметра (аўсюжных) — доўгія зярняты і дамешкі. Пры вярчэнні цыліндра адбываецца раздзяленне насення па фракцыях і ачыстка яго ад дамешкаў. Дыскавыя Т. найб. выкарыстоўваюцца на млынах і ў хлебапякарных пунктах. Ёсць спецыялізаваныя Т. — для кукурузы, лёну і інш. *В.М.Кандрацьеў.*



Трыер: а — трыерны блок (1 — трыерны цыліндр, 2, 3 — размеркавальнікі пярэдні і задні); б — схема работы (1 — жолаб, 2 — цыліндр з ячэістай паверхняй, 3 — шнэк).

ТРЫЕ́СТ (Trieste), горад на ПнУ Італіі. Адм. ц. вобласці Фрыулі-Венецыя-Джулія і прав. Трыест. Каля 300 тыс. ж. (2001). Порт на беразе Трыесцкага зал. Адрыятычнага мора. Паромная сувязь з Дурэсам (Албанія). Вузел чыгунак і аўтадарог. Аэрапорт. Пачатковы пункт нафтаправода Т. — Інгальштат (Германія). Прам-сць: суднабуд., вытв-сць суднавых рухавікоў, нафтаперапр., хім., цэм., харчовая. Ун-т. Музеі: гіст., марскі, натуральнай гісторыі. Міжнар. цэнтр тэарэт. фізікі. Рэшткі стараж.-рым. пабудоў; касцёлы Сан-Джуста і св. Міхаіла, венецыянская крэпасць (усе 14 ст.).

У старажытнасці Т. — рым. калонія. У 5—9 ст. горад захопліваліостготы, Візантыя, лангабарды, франкі. З сярэдзіны 10 ст. сіньёрамі Т. сталі біскупы. З 11 ст. тут існавала камуна, з 13 ст. самакіравальная. У пач. 13 ст. Т. авалодала Венецыя, у 1382 — аўстр. Габсбургі. У 1719—1891 горад меў статус свабоднага порта. У 1797 і 1805 акупіраваны, у 1809 анексіраваны Францыяй і да 1813 уваходзіў у *Ілірыйскія правінцыі*. Пасля 1-й сусв. вайны ў складзе Італіі. У 2-ю сусв. вайну акупіраваны ў 1943 фаш. Германіяй. Вызвалены ў 1945 югаслаўскай нац.-вызв. арміяй. Паводле мірнага дагавора з Італіяй 1947 Т. з невял. акругай вылучаны ў «Свабодную тэр. Т.» і атрымаў статус свабоднага порта. Паводле італа-югасл. пагаднення 1954 Т. і прылеглыя да яго на З тэрыторыі адышлі Італіі, тэрыторыя на У ад Т. — Югаславіі (цяпер тэр. Славеніі).

ТРЫЁД [ад грэч. tri- — у складаных словах — тры + (*электр*)*од*], трохэлектродная *электравакуумная прылада*. Мае тэрмаэлектронны *катод* (прамога ці ўскоснага напальвання), кіроўную сетку і *анод*.

Вынайдзены амер. інжынерам Л.Форэстам (1906) як *прыёмна-ўзмацняльная лямпа*, прапанаваны нямецкім вучоным А.Майснерам як *генератарная лямпа* (1913). Канструкцыя і значэнні параметраў Т. залежаць у асн. ад іх прызначэння. Бывае здвоены (2 Т. ў адным балоне), а таксама спалучаны з інш. сістэмамі (гл. *Лямпа электронная*). Выкарыстоўваецца ў радыётэхн. апаратуры для генерыравання эл. ваганняў, узмацнення напружання і магутнасці, а таксама для дэтэктыравання.

ТРЫЁДМЕТА́Н, тое, што *ёдаформ*.

ТРЫЁДТЫРАНІ́Н, гармон, які выпрацоўвае *шчытападобная залоза*. Паводле хім. прыроды блізкі да *тыраксіну*. Хутка пранікае ў клеткі. Уплывае на абмен рэчываў, рост і дыферэнцыроўку тканак.

ТРЫЁЗЫ, дыоксікарбанільныя злучэнні, ніжэйшыя *монацукрыды*. Да Т. адносяцца гліцэрынавы альдэгід, дыоксіацэтон. Фосфарныя эфіры Т. — прамежкавыя злучэнні пры анаэробных пераўтварэннях вугляводаў. У зялёных раслінах утвараюцца ў выніку фіксацыі вуглякіслага газу ў працэсе фотасінтэзу.

ТРЫ́ЗНА, заключная частка пахавальнага абраду ў стараж. славян. Напачатку Т. суправаджалася ваен. гульнямі, спаборніцтвамі, ахвярапрынашэннямі, песнямі, танцамі, памінальнай вячэрай па нябожчыку; пасля прыняцця хрысціянства захавала памінальныя песні і вячэру. Т. наз. таксама памінкі па нябожчыку.

ТРЫ́ЗНА Сямён Іванавіч (30.4.1890, г. Мазыр Гомельскай вобл. — 12.6.1968), бел. вучоны ў галіне селекцыі раслін. Д-р с.-г. н. (1963). Скончыў Кіеўскі ун-т (1916). У 1924—31 дырэктар Палескай пясчана-балотнай доследнай станцыі. У 1934—41 у НДІ балотнай гаспадаркі (заг. аддзела). У 1945—65 у Бел. НДІ



Трыгубіца.

меліярацыі і воднай гаспадаркі. Навук. працы па агратэхніцы і селекцыі збожжавых культур на тарфяна-балотных глебах Беларусі. Вывеў сорт аўса Серабрысты.

Тв.: Основы агротехники и селекции зерновых культур на торфяно-болотных почвах БССР. Мн., 1962.

ТРЫЗНЕ́ННЕ, псіхічнае расстройства, пры якім хворы чалавек з упэўненасцю гаворыць аб тым, чаго не існуе. Бывае пры *шызафрэніі, маніякальна-дэпрэсіўным псіхозе* і інш. хваробах псіхікі. Лечаць псіхатропнымі сродкамі.

ТРЫ́ЗНЫ, шляхецкі род герба «Газдава» ў ВКЛ. Паходзяць з правасл. баярства Браншчыны, з 2-й пал. 15 ст. валодалі маёнткам Палонка ў Ваўкавыскім пав. Найб. вядомыя:

Рыгор Іосіфавіч (каля 1500—71), маршалак гаспадарскі ў 1560—66, кашталян падляшскі ў 1566—69 і смаленскі з 1569. Валодаў маёнткамі Палонка, Ятвезск, Андрэевічы ў Ваўкавыскім пав., Дарсунішкі ў Ковенскім пав. З яго сыноў Пётр (?—1633) перайшоў у каталіцтва, быў старостам бабруйскім, ваяводам парнаўскім з 1626, Рыгор — маршалкам слонімскім. Мікалай (?—10.10.1640), сын Рыгора, падкаморы слонімскі з 1608, кухмістр ВКЛ у 1623—35, падскарбі земскі з 1635. Гедэон Міхал (?—11.9.1652), сын Рыгора, падстолі ВКЛ у 1631, стольнік ВКЛ у 1631—38, харунжы гродзенскі з 1637, крайчы ВКЛ у 1638—42, падчашы ВКЛ у 1642—44, падскарбі земскі з 1644; староста брэсцкі з 1624, суражскі і мсціслаўскі, адміністратар Гродзенскай і Магілёўскай эканомій. Марцыян (?—17.5 або 2.8.1643), сын Рыгора, канонік віленскі з 1620, адначасова духоўны пісар ВКЛ у 1628—41, духоўны рэферэндар ВКЛ у 1631—41, каад'ютар віленскі ў 1638—43, біскуп-суфраган беларускі з 1639, падканцлер ВКЛ з 1641. Павел Пётр (?—15.5.1639), сын Рыгора, староста старадубскі ў 1630—36, абозны ВКЛ у 1633—38, падстолі ВКЛ з 1638. Тэафіл (?—1645), сын Мікалая, староста ваўкавыскі, ваявода брэсцкі з 1642. *В.Л.Насевіч.*

ТРЫКАРБО́НАВЫХ КІСЛО́Т ЦЫКЛ, Крэбса цыкл, цыкл лімоннай кіслаты, цыклічная паслядоўнасць ферментатыўных акісляльных пераўтварэнняў *трыкарбонавых кіслот* і дыкарбонавых к-т; агульны заключны этап акісляльнага разбурэння прадуктаў абмену вугляводаў, тлушчаў і бялкоў (або амінакіслот) да вуглякіслага газу і вады. Важнейшы метабалічны цыкл у аэробных арганізмаў (мікраарганізмаў, раслін, жывёл, чалавека).

Адкрыты Х.*А.Крэбсам* і У.Джонсанам (1937). Т.к.ц. пачынаецца ўтварэннем лімоннай к-ты пры кандэнсацыі ацэтыльнай групы ацэтыл-КаА і шчаўевоцатнай к-ты і завяршаецца ўтварэннем шчаўевоцатнай к-ты, 2 малекул вуглякіслага газу і адноўленых кафермента́ў. Энергет. выхад Т.к.ц. — 12 малекул АТФ. Утвораная шчаўевоцатная к-та кандэнсуецца з новай малекулай ацэтыл-КаА і дае наступны віток цыкла. Гл. таксама *Акісленне біялагічнае.*

Літ.: Ленинджер А. Основы биохимии: Пер. с англ. Т. 1—3. М., 1985; Березов Т.Т., Коровкин Б.Ф. Биологическая химия. 3 изд. М., 1998; Эллиот В., Эллиот Д. Биохимия и молекулярная биология: Пер. с англ. М., 2000. *І.М.Семяненя.*

ТРЫКАРБО́НАВЫЯ КІСЛО́ТЫ, арганічныя кіслоты, якія маюць у малекуле па 3 карбаксільныя групы (-СООН); адносяцца да *карбонавых кіслот*. Найб. біялагічна важныя: *лімонная кіслата, шчаўевоцатная кіслата*, цыс-аканітавая, ізалімонная. Адыгрываюць важную ролю ў працэсах біяэнергетыкі і біясінтэзу. Удзельнічаюць у *трыкарбонавых кіслот цыкле.*

Найб. інтэнсіўна сінтэзуюцца і расходуюцца ў печані, ц.н.с., лімфоідных органах, эпітэліі страўнікава-кішачнага тракту, канальцах нырак. Т.к. пераносяцца праз клетачныя мембраны з дапамогай спец. трансп. бялкоў. Выкарыстоўваюцца ў эксперым. фармакатэрапіі метабалічных парушэнняў.

Літ.: Епринцев А.Т., Попов В.Н. Ферментативная регуляция метаболизма дикарбоновых кислот в растениях. Воронеж, 1999. *І.М.Семяненя, А.Г.Давыдоўскі.*

ТРЫКАТА́Ж (франц. tricotage ад tricoter вязаць), гатовыя вырабы або палатно, што вырабляюць *вязаннем* на *трыкатажных машынах*. Паводле структуры Т. падзяляюць на папярочнавязаны (кулірны) і асновавязаны, адзінарны і падвойны (больш шчыльны і цяжкі), гладкі і з малюнкамі; паводле прызначэння — на бялізнавы, верхні, панчошна-шкарпэтачны, пальчаткавы і інш. Кроеныя бялізнавыя вырабы, а таксама верхняе адзенне шыюць з трыкат. палатна; панчохі, шкарпэткі, пальчаткі, хусткі і інш. вырабы звычайна атрымліваюць на машынах у гатовым выглядзе. Гл. таксама *Трыкатажная прамысловасць.*

ТРЫКАТА́ЖНАЯ МАШЫ́НА, вязальная машына, машына для мех. вязання трыкатажнага палатна або трыкат. штучных вырабаў. Адрозніваюць Т.м. паводле прызначэння, канструкцыі, выгляду трыкат. іголак і інш. Класы прамысл. Т.м. вызначаюцца колькасцю іголак, што замяшчаюцца ў адзінцы даўжыні ігольніцы: чым танчэйшыя іголкі і меншая адлегласць паміж імі, тым вышэйшы клас машыны і вырабляецца больш тонкае палатно.

Падзяляюцца Т.м.: паводле спосабу петлеўтварэння на папярочна-вязальныя (кулірныя) і асновавязальныя; паводле прызначэння (для вязання палатна і штучных вырабаў); паводле колькасці ігольніц (аднафантурныя і двухфантурныя). У залежнасці ад канструкцыі ігольніц, у якіх замацоўваюцца іголкі, бываюць круглавязальныя (для вырабу палатна ў выглядзе трубкі) і плоскія (для вырабу палатна ў выглядзе тканіны). Асн. рабочыя органы (механізмы) Т.м.: петлеўтваральны (вязальны), падачы нітак (сілкавальны) і адцяжны (адвод ад ігольніц выраблянага трыкатажу з пастаянным нацяжэннем). Петлеўтваральны механізм мае ігольніцы з іголкамі (язычковымі, кручковымі або пазавымі), плацiны (пласцінкі складанай формы, што выгінаюць ніткі ў петлі), ніткавадзіцель і інш. Працэсы вязання на прамысл. Т.м. аўтаматызаваны, маюць электронныя сродкі кіравання. Існуюць таксама бытавыя вязальныя машыны і апараты. Асн. вузлы ручных машын: петлеўтваральныя элементы (язычковыя іголкі і плацiны), карэтка (накіроўвае іголкі і плацiны пры вязанні), лічыльнік радкоў і інш. Вязальныя апараты маюць кручкі, грэбень са штырамі, на які ўручную навешваюцца петлі, і лінейкі, з дапамогай якіх перасоўваюцца кручкі і рэгулюецца шчыльнасць вязання. *І.У.Косціна.*

ТРЫКА́ТАЖНАЯ ПРАМЫСЛО́ВАСЦЬ, галіна *лёгкай прамысловасці*, якая спецыялізуецца на вытв-сці бялізнавага і верхняга трыкатажу, панчошна-шкарпэткавых вырабаў, пальчатак, галаўных убораў, шаляў, трыкат. палатна, а таксама вырабаў мед. прызначэння. У якасці сыравіны ў Т.п. выкарыстоўваецца шарсцяная, баваўняная пража, штучны і сінт. шоўк і інш.

Выраб трыкат. адзення пачаў развівацца ў Францыі, Вялікабрытаніі і Германіі ў канцы 18 — пач. 19 ст., у Расіі — у канцы 19 ст. На Беларусі першая трыкат. ф-ка пачала працаваць у 1919 у Віцебску. У 1926 засн. невял. трыкат. майстэрня ў Гомелі, якая ў 1930 рэканструявана і расшырана ў панчошна-трыкат. ф-ку (гл. *Гомельская прамыслова-гандлёвая фірма «8 Сакавіка»*). У 1929—31 пабудавана Віцебская панчошна-трыкат. ф-ка (гл. *Віцебскае панчошна-трыкатажнае прадпрыемства «КІМ»*). У 1940 у БССР выпускалася 81 млн. пар панчошна-шкарпэткавых вырабаў, 17,4 млн. штук трыкат. бялізны, 1,2 млн. штук верхняга трыкатажу (адпаведна 16,7, 14 і 2,4% агульнасаюзнай іх вытв-сці). Пасля Вял. Айч. вайны на новай тэхн. аснове адноўлены даваен. і пабудаваны новыя спецыялізаваныя прадпрыемствы Т.п.

Таблiца

Вытворчасць трыкатажных вырабаў на Беларусі

Віды прадукцыі	Гады		
	1990	1995	2001
Панчошна-шкарпэткавыя вырабы, млн. пар:			
Усяго:	175	55	90
у т.л. для дзяцей	51	11	21
Трыкатажныя вырабы, млн. штук:			
Усяго:	169	39	49
у т.л. для дзяцей	87,8	20	21
Верхні спартыўны трыкатаж, млн. штук	25,7	3,6	6,3

П.І.Рогач.

У 2001 на Беларусі больш за 60 прадпрыемстваў Т.п. Найбуйнейшыя з іх: *Брэсцкі панчошны камбінат, Брэсцкая прамыслова-гандлёвая фірма «Элма»*, Пінскае прамыслова-гандлёвае аб'яднанне «Палессе» (гл. *Пінскі камбінат верхняга трыкатажу*), «Світанак» у Жодзіне, «Бабруйсктрыкатаж», «Купалінка» ў Салігорску і інш. У 2000 экспартавана трыкат. вырабаў на 72,9 млн. долараў, у т.л. ў краіны далёкага замежжа (Італія, Германія, ЗША, Вялікабрытанія і інш.) — на 38,5 млн. долараў. Даныя пра выпуск трыкат. вырабаў на Беларусі гл. ў табліцы.

ТРЫКУ́ТНІК (лац. Triangulum), сузор'е Паўн. паўшар'я неба. Знаходзіцца паміж сузор'ямі Андрамеды, Рыб, Оўна і Персея. Найб. яркія зоркі 3,0 і 3,4 візуальнай *зорнай велічыні*; 15 зорак ярчэй 6-й зорнай велічыні. У сузор'і Т. знаходзіцца адна з самых блізкіх і найб. даследаваных галактык (М 33). З тэр. Беларусі відаць летам, увосень і зімой. Гл. *Зорнае неба*.



Сузор'е **Трыкутнік**.

ТРЫЛАБІ́ТЫ (Trilobita), клас выкапнёвых беспазваночных жывёл тыпу членістаногіх. 2 падкл.: міямеры і палімеры. Каля 1,5 тыс. родаў. Жылі ў кембрыі — пермі ў морах у зонах глыбакаводнага шэльфа. Лічынкі вялі планктонны спосаб жыцця, пазней — донны. На Беларусі шматлікія рэшткі Т. выяўлены ў адкладах ардовіку (асабліва ніжняга), сілуру і ніжняга дэвону, рэдка ў верхнедэвонскіх і каменнавугальных адкладах. Па выкапнёвых рэштках вызначаюць узрост геал. адкладаў.

Цела эліпсоіднай формы даўж. да 75 см. падзялялася ўздоўж дзвюма падоўжнымі барознамі. Са спіны ўкрыта тонкім хітынавым панцырам. Галава накшталт паўмесяца з 5 парамі канечнасцей і вял. фасетачнымі вачамі. Тулава і хваставы аддзел мелі рухомыя счленены сегменты, што давала магчымасць жывёле пры небяспецы згортвацца.



Трылабіт.

ТРЫЛАТЭРА́ЦЫЯ (ад лац. trilaterus трохбаковы), метад вызначэння становішча апорных *геадэзічных пунктаў*; заключаецца ў стварэнні на мясцовасці сістэм сумежна размешчаных трохвугольнікаў, каардынаты вяршынь і вуглы якіх вылічваюць, даўжыні бакоў вызначаюць дальнамерам. Назначэнне Т. тое, што і *трыянгуляцыі*.

ТРЫ́ЛЕР (ад англ. thrill нервовае ўздрыгванне, хваляванне), асаблівы тып прыгодніцкіх фільмаў, літ. твораў, у якіх спецыфічныя сродкі павінны выклікаць у гледача ці чытача моцныя эмоцыі (трывожнае чаканне, непакой, страх і інш.). Элементы Т. выкарыстоўваюць таксама ў дэтэктывах, «фільмах жахаў», гангстэрскіх і «чорных» фільмах (крымінальныя фільмы, прасякнутыя адчуваннем безвыходнасці, ірацыянальнасці зла). У Т. акцэнт робіцца на псіхал. перажыванні персанажаў, звязаных са злачынствам. Шырока выкарыстоўваецца сюжэтны прыём зацягвання драм. паузы, якая выклікае нервовы непакой, а таксама моцныя выразныя сродкі — натуралістычныя падрабязнасці, шумавыя эфекты, спец. муз. афармленне і інш. Адзін з першых гукавых Т. — «М» («Забойца»; 1931, рэж. Ф.Ланг). Сцвярджэнне Т. ў кіно звязана з творчасцю англа-амер. рэж. А.Хічкака: фільмы «Жыхар» (1926), «Рэбека» (1940), «Псіхоз» (1960) і інш. Вядомасць набылі таксама Т. «Прабачце, вы памыліліся нумарам» (1948, рэж. А.Літвак), «Ліфт на эшафот» (1957, рэж. Л.Маль), «Маўчанне ягнят» (1991, рэж. Дж.Дэме), «Сем» (1995, рэж. Д.Фінчэр), «Экзістэнцыя» (1999, рэж. Д.Кроненберг) і інш.

ТРЫЛЕ́СІНА, вёска ў Дрыбінскім р-не Магілёўскай вобл. Цэнтр Першамайскага с/с і саўгаса. За 12 км на ПдЗ ад г.п. Дрыбін, 48 км ад Магілева, 23 км ад чыг. ст. Цёмны Лес. 1317 ж., 411 двароў (2002). Безалкагольных напіткаў і макаронны цэхі. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ТРЫЛО́ГІЯ (грэч. trilogia), тры адносна самастойныя творы, якія аб'ядноўваюцца ў адзіны цыкл агульнасцю ідэйнай задумы, галоўных герояў і пераемнасцю сюжэта.

Узнікла ў тэатры Стараж. Грэцыі. У ант. эпоху Т. называлі цыкл з 3 трагедый (напр., «Арэстэя» Эсхіла). У л-ры новага часу побач з драм. Т. развіваецца эпічная; у 20 ст. яна становіцца асн. відам Т. (творы А.Талстога, М.Горкага, В.Васілеўскай, М.Пуйманавай, У.Фолкнера).

Мера злучанасці асобных частак паміж сабою тут бывае розная. У Т. «На ростанях» («У Палескай глушы», «У глыбі Палесся», «На ростанях») Я.Коласа часткі цесна ўзаемазвязаны: вытрымліваецца адзіны кампазіцыйны план; біяграфія гал. героя, яго духоўнае станаўленне паслядоўна праходзяць праз увесь твор, які набывае маст. цэласнасць. У Т. «Шэметы» («На парозе будучыні», «Гарадок Устронь», «Шэметы») М.Лобана, «Сасна пры дарозе», «Вецер у соснах» і «Сорак трэці» (не мае агульнай назвы) І.Навуменкі часткі даволі самастойныя. Тут дзейнічае шэраг герояў буйнога плана, якія ў розных частках займаюць рознае месца ў сюжэце. Т. — разнавіднасць архітэктанічнай формы (гл. *Архітэктоніка*), якая можа аб'ядноўваць 2, 4, 5 твораў (*дылогія, тэтралогія, пенталогія*). Расчляненне літ. цэлага на 3 асобныя творы-часткі абумоўліваецца разгорнутасцю задумы, вял. аб'ёмам матэрыялу, своеасаблівасцю сюжэта і кампазіцыі, а таксама імкненнем зрабіць твор больш зручным для ўспрымання чытачом. *А.М.Пяткевіч.*

ТРЫЛЬЁН (франц. trillion), т ы с я ч а м і л ь я р д а ў, лік, які ў дзесятковым запісе мае выгляд адзінкі з 12 нулямі (лік 10^{12}). У некаторых краінах Т. наз. лік 10^{18}.

ТРЫМБЛ (Trimble) Уільям Дэйвід (н. 15.10.1944, г. Белфаст, Вялікабрытанія), дзяржаўны і паліт. дзеяч Паўн. Ірландыі. З 1975 дэп. Паўн.-Ірл. канстытуцыйнага канвента ад пратэстанцкай арг-цыі Авангард юніяністцкай прагрэс. партыі. З 1977 чл. гал. партыі пратэстанцкай большасці Паўн. Ірландыі — Ольстэрскай юніяністцкай партыі, з 1995 яе ген. сакратар. З 1990 дэпутат брыт. парламента. З вер. 1997 вёў перагаворы з гал. арг-цыяй каталіцкай меншасці Паўн. Ірландыі — Шын Фейн і яе лідэрам Дж.*Х'юмам*, якія скончыліся ў крас. 1998 падпісаннем мірнага пагаднення аб спыненні паўн.-ірл. міжрэліг. канфлікту. З чэрв. 1998 прэм'ер-міністр урада Паўн. Ірландыі. Нобелеўская прэмія міру 1998 (з Х'юмам).

ТРЫМЕ́СТР (ад лац. trimestris трохмесячны), частка вучэбнага года ў навуч. установах шэрагу замежных краін (Вялікабрытанія, часткова ЗША і інш.) працягласцю 10—12 тыдняў.

ТРЫМУ́РЦІ, у індуізме праяўленне трыадзінства вярхоўных багоў — *Брахмы, Вішну* і *Шывы*. Выяўляецца з адной галавой і трыма тварамі.

ТРЫНА́ЦЦАТАЯ КАНФЕР́ЭНЦЫЯ КП(б)Б, гл. *Восьмы з'езд КП(б)Б*.

ТРЫНА́ЦЦАТЫ З'ЕЗД КП(б)Б. Адбыўся 30.5—12.6.1930 у Мінску. Прысутнічала 356 дэлегатаў з рашаючым і 286 з дарадчым голасам ад 46 805 чл. і канд. у чл. партыі [разам з вайсковымі арг-цыямі; 39 256 чл. і канд. у чл. КП(б)Б]. Парадак дня: даклады аб рабоце ЦК ВКП(б) (Дз.З.Мануільскі), ЦКК ВКП(б) (М.А.Трылісер); паліт. справаздача ЦК КП(б)Б (К.В.Гей); арганізац. справаздача ЦК КП(б)Б (І.А.Васілевіч); справаздача ЦКК КП(б)Б (А.Я.Калнін); даклады аб ходзе выканан-

ня 5-гадовага плана развіцця прам-сці (К.Ф.Бенек); аб калгасным руху і ўздыме сельскай гаспадаркі (М.М.Галадзед); аб задачах прафсаюзаў у рэканструкцыйны перыяд (І.П.Рыжоў); выбары кіруючых органаў партыі. З'езд прапанаваў ЦК і парт. арг-цыям: працягваць курс на *індустрыялізацыю*; умацоўваць калгасы і няўхільна павялічваць іх колькасць; выпраўляць памылкі і скрыўленні, дапушчаныя ў калгасным буд-ве; аднавіць разбураную нізавую сетку с.-г. кааперацыі; знайсці дадатковыя крыніцы забеспячэння прац. насельніцтва прадуктамі харчавання і рацыянальна выкарыстоўваць харч. рэсурсы. Умовамі паспяховага выканання намечанага курсу павінны былі стаць «бязлітасная барацьба» супраць правага апартунізму як гал. небяспекі на тым этапе развіцця, «левых» трацкісцкіх перагібаў, прымірэнства, усякіх ваганняў у нац. пытанні. Асаблівы акцэнт з'езд зрабіў на вынікі ідэолага-паліт. кампаніі супраць *нацыянал-дэмакратызму* і правага ўхілу, якая разгарнулася пасля праверкі ў маі—чэрв. 1929 камісіяй ЦКК ВКП(б) на чале з У.П.Затонскім практыкі нац. работы ў БССР. Многія дэлегаты ў сваіх прамовах заяўлялі, што настаў час разглядаць бел. нацыянал-дэмакратызм як гал. небяспеку для партыі. З'езд выбраў ЦК КП(б)Б з 112 чл. і 62 канд., ЦКК КП(б)Б з 89 чл., Цэнтр. рэвіз. камісію КП(б)Б з 9 чл.

Літ.: XIII зьезд Камуністычнай партыі (б.) Беларусі: Стэнагр. справаздача, 30 мая — 12 чэрвеня 1930 г. Мн., 1931; Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК. Т. 2. 1928—1932. Мн., 1984.

Р.П.Платонаў.

ТРЫНАЦЦАЦІГАДО́ВАЯ ВАЙНА́ 1454—66, вайна паміж *Тэўтонскім ордэнам* і Польскім каралеўствам. Пачалася ў лют. 1454 паўстаннем супраць ордэна, падрыхтаваным т.зв. Прускім саюзам (створаны ў 1440, аб'ядноўваў апазіцыйныя ордэну гарады, дробных рыцараў Памор'я Прусіі). З-пад улады ордэна былі вызвалены Гданьск, Торунь, Эльбланг, Кралявец (Кёнігсберг). У сак. 1454 польскі кароль *Казімір IV* абвясціў пра ўключэнне зямель ордэна ў склад Польшчы. Польскае апалчэнне ўступіла ва ўладанні ордэна, аднак у вер. 1454 пацярпела паражэнне каля Хайніцаў. Вайна прыняла зацяжны характар, ордэн атрымаў падтрымку Брандэнбурга і інш. герм. княстваў. Паваротным пунктам у вайне стала перамога польскіх войск у 1462 у бітве каля Жарноўца; шэраг паражэнняў войскі ордэна пацярпелі ў 1465—66. Скончылася вайна *Тарунскім мірам 1466*, паводле якога Польскае каралеўства зноў атрымала выхад да Балт. м.; вярнула сабе Усх. Памор'е з г. Гданьск, Хэлмскую і Міхалоўскую землі з г. Торунь, зах. частку Прусіі і Вармію. Тэўтонскі ордэн, пад уладай якога засталася Усх. Прусія, прызнаў сябе *васалам* польскага караля.

ТРЫНАЦЦАЦІСКЛАДО́ВІК, у польскім. бел. і рус. сілабічным вершаскладанні памер у 13 складоў з цэзурай пасля 7-га склада.

Развіўся з сярэдневяковага лац. «ваганцкага верша» (6-стопны харэй з дактылічнай цэзурай), перапрацаванага ў адпаведнасці з асаблівасцямі польскай мовы (націск на перадапошнім складзе).

Т. лічыўся «высокім» памерам. Ім напісаны панегірыкі А.Рымшы, многія ананімныя вершы 16—17 ст. Сімяон Полацкі пашырыў сферу ўжывання Т., ён пісаў элегіі, дэкламацыі, алегорыі. У бел. л-ры 19 ст. сустракаецца рэдка, ім напісаны некаторыя рамансы ў «Сялянцы» В.Дуніна-Марцінкевіча, верш Я.Лучыны «Стары ляснік» і інш.

А.А.Майсейчык.

ТРЫНІДА́Д (Trinidad), востраў у Атлантычным ак., каля паўн.-ўсх. берагоў Паўд. Амерыкі, асн. частка дзяржавы *Трынідад і Табага*. Пл. 4,8 тыс. км^2. На Пн хрыбет выш. да 940 м (г. Арыпа). Астатняя тэр. — пераважна нізінная раўніна, на У забалочаная. Радовішчы прыроднага асфальту, нафты (на шэльфе), прыроднага газу. Клімат субэкватарыяльны. Сярэднія месячныя т-ры 25—27 °С. Ападкаў ад 1200 мм за год на З да 3800 мм на ПнУ. Пераважаюць вечназялёныя лясы, на ПнЗ — рэдкалессе.

ТРЫНІДА́Д І ТАБА́ГА (Trinidad and Tobago), Рэспубліка Трынідад і Табага (Republic of Trinidad and Tobago), дзяржава ў Вест-Індыі на аднайм. астравах каля паўн. ўзбярэжжа Паўд. Амерыкі. Пл. 5,1 тыс. км^2. Нас. 1175,5 тыс. чал. (2000). Афіц. мова — англійская. Сталіца, гал. эканам. цэнтр і порт — г. *Порт-оф-Спейн*. Краіна падзяляецца на 8 графстваў і 3 муніцыпалітэты. Нац. свята — Дзень незалежнасці (31 жн.).

Дзяржаўны лад. Т. і Т. — рэспубліка. Дзейнічае канстытуцыя 1976. Кіраўнік дзяржавы — прэзідэнт, які выбіраецца калегіяй выбаршчыкаў з членаў парламента на 5 гадоў. Заканад. ўлада належыць двухпалатнаму парламенту, які складаецца з сената (31 член) і палаты прадстаўнікоў (36 дэпутатаў), што выбіраюцца на 5 гадоў; 9 сенатараў назначае прэзідэнт, 16 — рэкамендуе прэм'ер-міністр, 6 — лідэр апазіцыі. Выканаўчую ўладу ажыццяўляе кааліцыйны ўрад.

Прырода. В-аў *Трынідад* (пл. 4,8 тыс. км^2) пераважна раўнінны. Ёсць 3 невысокія горныя ланцугі (выш. да 940 м). На в-ве *Табага* (пл. 0,3 тыс. км^2) горы (выш. да 579 м) і вапняковае плато. На в-ве Трынідад радовішчы нафты (на сушы і на шэльфе), асфальту (воз. Пітч-Лейк), прыроднага газу. Клімат субэкватарыяльны, гарачы і вільготны. Сярэднямесячныя т-ры 25—27 °С. Ападкаў за год ад 1200 мм на З да 3800 мм на У. Бываюць разбуральныя трапічныя ўраганы. Трапічныя лясы (трынідадскі цік, карыбская хвоя, махагоневае дрэва, чырвоны сандал, бальса і інш.) займаюць 46% тэр. Фауна мае падабенства з фаунай Паўд. Амерыкі. Трапляюцца пекары, ацэлот, апосум, агуці, малпакапуцын, кажаны, чарапахі, змеі, алігатары. Шмат птушак. Ёсць рэзерваты і марскі запаведнік.

Насельніцтва. Жывуць негры (39,5%, нашчадкі рабоў), індыйцы (40,3%, нашчадкі закантрактаваных рабочых з Паўн. Індыі), мулаты (18,4%), еўрапейцы, кітайцы і інш. Сярод вернікаў хрысціяне (62%, пераважна католікі і англікане), індуісты (25%), мусульмане (6%) і інш. Сярэднегадавы прырост каля 1%. Сярэдняя шчыльн. 230,5 чал. на 1 км^2. Больш шчыльна (да 400 чал. на 1 км^2) заселена зах. ч. в-ва Трынідад. Гар. насельніцтва 73%. У г. Порт-оф-Спейн з прыгарадамі больш за 300 тыс. ж. (1996), у г. Сан-Фернанда каля 50 тыс. ж., астатнія гарады невялікія. У прам-сці занята каля 30% эканамічна актыўнага насельніцтва, у сельскай гаспадарцы — каля 10%, у абслуговых галінах — каля 60%.



Герб і сцяг **Трынідада і Табага**.



Гісторыя. На час адкрыцця ў 1498 Х.*Калумбам* в-аў Трынідад быў населены індзейцамі-аравакамі, в-аў Табага — карыбамі. У 1532—1797 в-аў Трынідад быў ісп. калоніяй, у 1797 захоплены Вялікабрытаніяй (афіцыйна замацаваны за ёй у 1802). За валоданне в-вам Табага спрачаліся розныя еўрап. дзяржавы (у 1652—58 — уладанне *Курляндскага герцагства*, васала ВКЛ), у 1763 захоплены Вялікабрытаніяй (замацаваны за ёй у 1814). У 1889 абодва востравы аб'яднаны ў адзіную калонію. У выніку лютай эксплуатацыі большасць індзейцаў знішчана, замест іх для працы на плантацыях прывозіліся негры-рабы з Афрыкі. Пасля скасавання рабства ў 1834 пачалася эміграцыя рабочых з Індыі і Кітая. У 1958—62 Т. і Т. — чл. Вест-Індскай федэрацыі. 31.8.1962 абвешчана незалежнасць Т. і Т. ў складзе *Садружнасці*.

1.8.1976 абвешчана рэспубліка. Да сярэдзіны 1980-х г. у палітычным жыцці краіны дамінавала Нар. нац. партыя, якая адлюстроўвала інтарэсы пераважна афрат-



Да арт. **Трынідад і Табага**. Заходняе ўзбярэжжа вострава Трынідад.

рынідадцаў. З канца 1980-х г. вял. ўплыў у палітыцы набыў Аб'яднаны нац. кангрэс, які адлюстроўвае інтарэсы індатрынідадскай абшчыны і з 1995 узначальвае ўрад дзяржавы. Т. і Т. — чл. ААН (з 1962), Арг-цыі амер. дзяржаў (з 1967). Дзейнічаюць палітычныя партыі: Аб'яднаны нац. кангрэс, Нар. нац. партыя, Нац. саюз за рэканструкцыю.

Гаспадарка. Т. і Т. — адна з развітых краін Карыбскага бас., мае развітую эканоміку з моцным прыватным і невялікім дзярж. сектарамі. У 1999 валавы ўнутр. прадукт склаў 4,4 тыс. дол. на 1 чал., у т.л. ў нафтавым сектары ствараецца 21,4%, у астатніх галінах прам-сці і буд-ве — 18,6%, у сельскай гаспадарцы — 2%, у гандлі і турызме — 18,3%, у інш. абслуговых галінах — 39,7%. У прам-сці гал. ролю адыгрывае здабыча і перапрацоўка нафты і газу. Здабычу вядуць пераважна замежныя кампаніі. У 1998 здабыта 7,1 млн. т нафты і каля 1 млрд. м^3 газу. Асноўную частку нафты здабываюць на марскіх радовішчах. Вытв-сць нафтапрадуктаў каля 8 млн. т (1998); акрамя мясц. перапрацоўваецца нафта з Венесуэлы і інш. краін. Асн. цэнтры нафтаперапрацоўкі і нафтахіміі на З в-ва Трынідад у наваколлі г. Сан-Фернанда (у т.л. 3 нафтаперапр. з-ды, нафтахім. камбінат, з-д па вытв-сці азотных угнаенняў). Распрацоўваюцца запасы асфальту (воз. Піч-Лейк), штогадовая здабыча 100—200 тыс. т. Вытв-сць электраэнергіі 4,8 млрд. кВт·гадз (1998), пераважна на ЦЭС. З галін апрацоўчай прам-сці найб. развіты цукр., цэм., тэкст., абутковая, дрэваапр., папяровая, фармацэўтычная, буд. матэрыялаў. Ёсць металург. з-д, прадпрыемствы па вытв-сці пластмас і хімікатаў, па зборцы легкавых аўтамабіляў і тэлевізараў. Нарыхтоўка драўніны каштоўных парод. Шмат дробных прадпрыемстваў харч. прам-сці. Развіты саматужныя промыслы. У сельскай гаспадарцы выкарыстоўваецца каля 133 тыс. га зямлі, у т.л. пад ворывам 77 тыс. га, пад шматгадовымі насаджэннямі 46 тыс. га, пад пашай 10 тыс. га. Пануе буйное землеўладанне. Гал. экспартная культура — цукр. трыснёг, займае каля 40 тыс. га, штогадовы збор каля 2 млн. т (каля 200 тыс. т цукру). Меншае значэнне маюць какава, кава, какосавая пальма, цытрусавыя, бананы, тытунь. Асн. харч. культуры: рыс, ямс, бабовыя, кукуруза, маніёк, батат, агародніна. Трапічнае садоўніцтва. Жывёлагадоўля, развіта слаба. Пагалоўе (тыс. галоў): буйн. раг. жывёлы — каля 70, свіней — каля 50, коз — каля 40. Птушкагадоўля (8,5 млн. курэй, 1997). Рыбалоўства (15 тыс. т, 1999). Транспарт аўтамаб. і марскі. У краіне 8,3 тыс. км. аўтадарог, у т.л. 4,3 тыс. км з цвёрдым пакрыццём; 128 тыс. легкавых, 27 тыс. грузавых аўтамабіляў і аўтобусаў. Гал. марскія парты: Порт-оф-Спейн, Пуэнт-а-П'ер, Пойнт-Фортын, Скарбара. На астравах 6 аэрапортаў, у т.л. 2 міжнародныя. Сетка нафтаправодаў і газаправодаў злучае месцы здабычы з перапрацоўчымі і трансп. цэнтрамі. У 1998 экспарт склаў 2,4 млрд. дол., імпарт — 3 млрд. долараў. У экспарце пераважаюць нафта і нафтапрадукты (64%), хімікаты і ўгнаенні, сталь і пракат, цукар, какава, кава, цытрусавыя, кветкі; у імпарце — абсталяванне, трансп. сродкі, прамысл. і харч. тавары, нафта. Гандаль пераважна з ЗША (36,9% экспарту, 44,7% імпарту), краінамі Лац. Амерыкі (адпаведна 39,1% і 18,9%), Вялікабрытаніяй і Японіяй. Т. і Т. — развітая турыстычная краіна, штогод наведвае больш за 200 тыс. турыстаў пераважна з ЗША, Канады, краін Зах. Еўропы. Асн. турыстычныя цэнтры на в-ве Табага. Грашовая адзінка — долар Т. і Т.

ТРЫНІТРАТАЛУО́Л, 2,4,6-трынітраталуол, тратыл, тол, ТНТ, араматычнае *нітразлучэнне*; найважн. *брызантнае выбуховае рэчыва*. Атрыманы ў 1863 ням. хімікам Й.Вільбрантам.

Бясколерныя крышталі (тэхн. Т., жоўты), $t_{пл}$ 80,85 °С, шчыльн. 1663 кг/м^3 (літага 1540—1590 кг/м^3). Добра растваральны ў бензоле, талуоле, ацэтоне, азотнай і сернай к-тах, мала — у вадзе. Хімічна ўстойлівы; працяглы час захоўваецца без раскладання. Выбуховыя ўласцівасці Т.: цеплата выбуху 4190 кДж/кг, макс. скорасць дэтанацыі 7 км/с (пры шчыльн. 1600 кг/м^3), т-ра ўспышкі 290 °С. Менш адчувальны да ўдару і трэння, больш бяспечны ў абыходжанні за інш. выбуховыя рэчывы. У прам-сці атрымліваюць *нітраванне* талуолу сумессю азотнай і сернай кіслот пры 50—120 °С з наступнай ачысткай водным растворам сульфіту натрыю. Выкарыстоўваюць для начыньвання боепрыпасаў і пры правядзенні выбуховых работ.



Я.Г.Міляшкевіч.

ТРЫНІТРАФЕНО́Л, 2,4,6-трынітрафенол, пікрынавая кіслата, араматычнае *нітразлучэнне*.

Жоўтыя крышталі, $t_{пл}$ 122,5 °С, шчыльн. 1763 кг/м^3. Добра растваральны ў канцэнтраванай сернай кіслаце і арган. растваральніках, мала — у вадзе. Брызантнае выбуховае рэчыва больш адчувальнае да ўдару і трэння, чым *трынітраталуол*. Моцная к-та, солі Т. з металамі — пікраты (утвараюцца пры кантакце з металамі і іх аксідамі) лёгка загараюцца і ўзрываюцца. У канцы 19 — пач. 20 ст. выкарыстоўвалі як выбуховае рэчыва. Атрутны, ГДК 0,1 мг/м^3.

ТРЫ́О (італьян. trio ад лац. tres, tria тры), 1) ансамбль з трох выканаўцаў. Паводле выканальніцкага складу адрозніваюць інстр., вак. і вак.-інстр.; паводле складу інструментаў — аднародныя і мяшаныя. 2) Сярэдняя частка інстр. п'есы ў складанай 3-часткавай форме танц. характару (менуэты, скерца, маршы, вальсы, паланэзы). У бел. аўтараў вядомы Т. М.Аладава, А.Багатырова, Г.Вагнера, Я.Глебава, У.Дарохіна, С.Картэса, Дз.Смольскага, Р.Суруса, М.Чуркіна і інш. 3) Муз. твор для трох выканаўцаў (пераважна інстр. Т.). Лепшыя ўзоры інстр. Т. вылучаюцца развітасцю партый, іх раўнапраўем, глыбінёй маст. задумы.

Т. бел. кампазітараў (Л.Абеліёвіча, Аладава, Багатырова, Вагнера, Я.Дзягцярыка, В.Залатарова, П.Падкавырава, Ю.Семянякі, А.Туранкова, К.Цесакова, Я.Цікоцкага, Л.Шлег і інш.) адрозніваецца самабытным пераўтварэннем нар.-песенных інтанацый, выкарыстаннем узораў бел. фальклору, стварэннем вобразна-эмац. кантрастаў лірыка-псіхал. і жанравага планаў.

Літ.: Гайдамович Т. Инструментальные ансамбли. 2 изд. М., 1963; Раабен Л. Инструментальный ансамбль в русской музыке. М., 1961; Миронов Л. Трио Бетховена для фортепиано, скрипки и виолончели. М., 1974; Петраш А. Жанры позднеренессансной инструментальной музыки и становление сонаты и сюиты // Вопросы теории и эстетики музыки. Л., 1975. Вып. 14.

Т.А.Шчэрба.

СУПРАЦОЎНІКІ ВЫДАВЕЦТВА «БЕЛАРУСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ», ЯКІЯ ПРЫМАЛІ ЎДЗЕЛ У ПАДРЫХТОЎЦЫ І ВЫДАННІ 15-га ТОМА БЕЛАРУСКАЙ ЭНЦЫКЛАПЕДЫІ

Галоўная рэдакцыя

Галоўны рэдактар — Г.П.Пашкоў; намеснік галоўнага рэдактара Т.Я.Буракова; намеснік галоўнага рэдактара Г.А.Фатыхава; намеснік галоўнага рэдактара — адказны сакратар А.К.Фядосаў.

Навукова-галіновыя і кантрольныя рэдакцыі

Рэдакцыя гісторыі Беларусі

Заг. рэдакцыі — кандыдат гістарычных навук Л.У.Языковіч; вядучыя навуковыя рэдактары В.В.Гусева, кандыдат гістарычных навук В.С.Пазднякоў, А.В.Скараход; навуковыя рэдактары В.В.Грынявецкі, М.І.Рэменіца, кандыдат гістарычных навук Т.С.Скрыпчанка.

Рэдакцыя ўсеагульнай гісторыі

Заг. рэдакцыі — Ю.В.Бажэнаў; вядучы навуковы рэдактар М.Г.Нікіцін; навуковыя рэдактары кандыдат гістарычных навук В.У.Адзярыха, Н.А.Дзянісава, У.Я.Калаткоў.

«Ваенная справа»: кіраўнік групы — палкоўнік запасу, кандыдат філасофскіх навук Р.Ч.Лянькевіч; вядучы навуковы рэдактар падпалкоўнік запасу В.А.Юшкевіч.

Рэдакцыя філасофіі, эканомікі і права

Заг. рэдакцыі — кандыдат філасофскіх навук С.Ф.Дубянецкі; вядучыя навуковыя рэдактары Т.М.Грынько, Г.А.Маслыка; навуковыя рэдактары А.М.Гарбаценкаў, Н.Г.Кісялёва.

Рэдакцыя літаратуры і мастацтва

Заг. рэдакцыі — Л.В.Календа; вядучыя навуковыя рэдактары Г.М.Малей, Т.Р.Мартыненка, Т.В.Пешына, кандыдат філалагічных навук І.У.Саламевіч, А.В.Спрынчан; навуковыя рэдактары Н.В.Грэская, А.І.Клімовіч, Т.В.Чарнякова, І.Л.Чэбан; рэдактар Н.В.Мароз.

Рэдакцыя біялогіі, медыцыны і сельскай гаспадаркі

Заг. рэдакцыі — кандыдат біялагічных навук Л.В.Кірыленка; вядучыя навуковыя рэдактары кандыдаты біялагічных навук С.С.Ермакова, А.М.Петрыкаў, вядучы навуковы рэдактар Т.І.Жукоўская; навуковы рэдактар В.Л.Мароз.

Рэдакцыя геаграфічных навук

Заг. рэдакцыі — кандыдат гістарычных навук В.П.Кісель; вядучыя навуковыя рэдактары І.Я.Афнагель, Л.В.Лоўчая; навуковыя рэдактары Ю.В.Бярэзіна, кандыдат геолага-мінералагічных навук Р.Р.Паўлавец.

Рэдакцыя фізіка-матэматычных і тэхнічных навук

Заг. рэдакцыі — кандыдат фізіка-матэматычных навук А.І.Болсун; вядучыя навуковыя рэдактары П.С.Габец, У.М.Сацута, А.П.Чарнякова, Л.М.Шахлевіч; навуковы рэдактар В.З.Анісовіч.

Рэдакцыя навуковага і літаратурнага кантролю

Заг. рэдакцыі — кандыдат гістарычных навук І.П.Хаўратовіч; вядучыя навуковыя рэдактары В.В.Гетаў, І.У.Косціна, Н.К.Мазоўка, М.А.Маўзон, Т.І.Нішт, С.У.Пешын, М.В.Пятроўская, Е.П.Фешчанка; навуковыя рэдактары Т.У.Люковіч, А.А.Мааль.

Рэдакцыя мастацка-тэхнічнага афармлення выданняў

Заг. рэдакцыі — У.М.Жук; вядучыя мастацкія рэдактары В.Г.Загародні, В.У.Мінько; мастацкія рэдактары І.В.Каранкевіч, Т.В.Шабунька; навуковы рэдактар В.М.Вераценнікава.

Група картаграфіі: вядучы навуковы рэдактар Г.Р.Шыкунова; навуковы рэдактар В.Ф.Надзененка.

Рэдакцыя аналізу і каардынацыі ўнутрывыдавецкай дзейнасці

Заг. рэдакцыі — Л.М.Шастакова; вядучы навуковы рэдактар М.У.Маркевіч; навуковы рэдактар Г.Т.Глушчанка; машыністкі Г.Л.Анісімава, Т.М.Саленік, Л.І.Шыбаева.

Група тэхнічных рэдактараў: М.І.Грыневіч, Н.М.Шэвель.

Рэдакцыя фотаздымак і фотаілюстрацый

Заг. рэдакцыі — Г.М.Бажанкоў; фотакарэспандэнты А.П.Дрыбас, В.У.Харчанка; інжынер-тэхнолаг С.А.Жукавень.

Рэдакцыя камп'ютэрнай падрыхтоўкі рукапісаў

Заг. рэдакцыі — С.А.Макаёнак; інжынеры І.І.Драздова, С.А.Стралкоўская; ст. аператары Р.У.Дзявочка, Н.М.Зубкевіч, Н.У.Мітраховіч, І.А.Навіцкая, Н.А.Стасевіч.

Вытворчы аддзел

Заг. аддзела — Т.М.Грыцышын; інжынер-тэхнолаг Ю.В.Мельнік.

Участак размнажальнай тэхнікі: Я.М.Кузьміна, Ф.А.Юркевіч.

Карэктарскі аддзел

Заг. аддзела — В.М.Чудакова; ст. карэктары Ж.С.Берасневіч, Л.А.Варабей, Т.П.Гілевіч, П.В.Грынчанка, В.А.Кульбіцкая.

Навуковая бібліятэка

Заг. бібліятэкі — Г.А.Краўчанка.

Агульны аддзел

Заг. аддзела — ст. інспектар па кадрах Т.А.Кароткіна; спецыялісты І.В.Бурко, К.А.Каптурава.

Аддзел бухгалтарскага ўліку

Галоўны бухгалтар — В.І.Герыловіч; намеснік галоўнага бухгалтара Л.Я.Пілецкая; вядучыя бухгалтары Т.Р.Аўтуховіч, В.П.Дабрагост, І.М.Жылінская; бухгалтар І.В.Грыгор'ева.

Планава-эканамічны аддзел

Вядучы эканаміст Т.І.Лук'янава; эканаміст І.А.Азаранка.

Аддзел рэалізацыі і маркетынгу

Заг. аддзела — В.А.Рабкоў; вядучыя спецыялісты С.А.Акружко, І.Л.Мірон; спецыялісты В.Г.Бехціна, А.І.Кудраўцава, М.Ф.Пачэпка.

Гаспадарчы аддзел

Заг. аддзела — І.А.Шор.

Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. Т. 15: Следавікі — Трыо / Рэдкал.: Г.П.Пашкоў і інш. — Мн.: БелЭн, 2002. — 552 с.: іл.

Б 43

ISBN 985-11-0251-2 (т.15)
ISBN 985-11-0035-8

УДК 03(476)
ББК 92(4Беи)

БЕЛАРУСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ТОМ 15

СЛЕДАВІКІ — ТРЫО

У томе змешчаны 948 ілюстрацый, у т.л. 247 партрэтаў, 42 карты

Мастацкае афармленне *Э.Э.Жакевіча, А.М.Хількевіча*

Мастацкія рэдактары: *В.Г.Загародні, І.В.Каранкевіч, В.У.Мінько, Т.В.Шабунька*

Тэхнічныя рэдактары: *М.І.Грыневіч, Н.М.Шэвель*

Карэктары: *Ж.С.Берасневіч, Л.А.Варабей, Т.П.Гілевіч, П.В.Грынчанка, В.А.Кульбіцкая, В.М.Чудакова*

Падпісана да друку 16.11.2002. Фармат 84×108 $^{1}/_{16}$. Гарнітура Таймс. Папера афсетная. Друк афсетны. Ум. друк. арк. 57,96. Ум. фарб.-адб. 232,68. Ул.-выд. арк. 99,41. Тыраж 10 000 экз. Заказ 389.

Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства «Выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь па друку. Ліцэнзія ЛВ № 10 ад 10.11.2000. Рэспубліка Беларусь. 220072, Мінск, Акадэмічная, 15а.

Надрукавана з арыгінала-макета на Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Мінская фабрыка каляровага друку». Рэспубліка Беларусь. 220024, Мінск, Каржанеўскага, 20.

ISBN 985-11-0251-2

9 789851 102514



БЕЛАРУСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ